# БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

# БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ў 18 ТАМАХ

# БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ТОМ 1

А
АРШЫН

**РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ:**

**Г.П.ПАШКОЎ** (галоўны рэдактар з 1996), **Б.І.САЧАНКА** (галоўны рэдактар да 5.7.1995), **Я.В.МАЛАШЭВІЧ** (в.а. галоўнага рэдактара з 21.8.1995 да 20.2.1996), **В.С.АНОШКА, В.С.АНТАНЮК, Я.М.БАБОСАЎ, Г.М.БУРАЎКІН, А.І.БУТЭВІЧ, М.С.ВЫСОЦКІ, В.А.ГАЙСЁНАК, А.М.ГАНЧАРЭНКА, Р.Г.ГАРЭЦКІ, Н.С.ГІЛЕВІЧ, М.І.ДЗЯМЧУК, Р.А.ЖМОЙДЗЯК, В.В.ЗУЁНАК, В.А.КАВАЛЕНКА, Ф.М.КАПУЦКІ, М.П.КАСЦЮК, У.М.КОНАН, М.М.КУРЛОВІЧ, А.А.ЛОЙКА, І.М.ЛУЧАНОК, Г.М.ЛЫЧ, А.А.МІХАЙЛАЎ, У.М.НІЧЫПАРОВІЧ, А.І.ПАДЛУЖНЫ, М.Ф.ПІЛІПЕНКА, А.В.САБАЛЕЎСКІ, С.П.САМУЭЛЬ** (намеснік галоўнага рэдактара), **В.І.СТРАЖАЎ, Л.М.СУШЧЭНЯ, У.Л.СЯНЬКО, І.П.ХАЎРАТОВІЧ** (намеснік галоўнага рэдактара), **В.П.ШАРАНГОВІЧ, Д.І.ШЫРАКАНАЎ, Л.Ф.ЯЎМЕНАЎ.**

МІНСК
«БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ»
1996

ББК 92(4Беи)
Б 43
УДК 03(476)

НАВУКОВА-РЭДАКЦЫЙНЫ САВЕТ:

А.М.АБРАМОВІЧ, М.М.АЛЯХНОВІЧ, П.А.АПАНАСЕВІЧ, І.В.АРЖАХОЎСКІ, С.А.АСТАПЧЫК, С.А.БАГДАНКЕВІЧ, М.В.БІЧ, А.А.БОГУШ, А.І.БОЛСУН, В.С.БУРАКОЎ, Т.М.БУТЭВІЧ, А.П.ВАЙТОВІЧ, І.Д.ВАЛАТОЎСКІ, Т.В.ГАБРУСЬ, І.В.ГАЙШУН, С.І.ГРЫБ, А.П.ГРЫЦКЕВІЧ, А.П.ДАСТАНКА, С.Ф.ДУБЯНЕЦКІ, А.А.ДЫЛЕЙКА, М.І.ЕРМАЛОВІЧ, І.М.ІГНАЦЕНКА, М.А.ІЗОБАЎ, Л.В.КАЛЕНДА, Я.Ф.КАНАПЛЯ, А.К.КАЎКА (Масква), ВІТАЎТ КІПЕЛЬ (ЗША), В.П.КІСЕЛЬ, Г.В.КІСЯЛЁЎ, Г.К.КІСЯЛЁЎ, У.С.КОШАЛЕЎ, А.В.КРАСІНСКІ, П.К.КРАЎЧАНКА, Г.Р.КУЛЯШОВА, А.І.ЛЕСНІКОВІЧ, А.С.ЛІС, А.М.ЛІТВІН, І.І.ЛІШТВАН, У.Ф.ЛОГІНАЎ, П.А.ЛОЙКА, З.Я.МАЖЭЙКА, М.А.МАЙЕР, А.С.МАЙХРОВІЧ, А.І.МАЛЬДЗІС, А.М.МІХАЛЬЧАНКА, А.Я.МІХНЕВІЧ, У.М.МІХНЮК, В.Ф.МЯДЗВЕДЗЕЎ, М.В.НІКАЛАЕЎ (С.-Пецярбург), В.І.ПАРФЁНАЎ, У.А.ПЛІПОВІЧ, М.М.ПІКУЛІК, М.І.ПЛАТНІЦКІ, А.У.РОМАН, А.І.РУЦКІ, У.М.РЫЖАНКОЎ, Я.М.САХУТА, В.В.СВІРЫДАЎ, В.І.СЕМЯНКОЎ, А.М.СІДАРЭВІЧ, І.Д.СІПАКОЎ, В.У.СКАЛАБАН, А.Г.СЛУКА, М.С.СТАШКЕВІЧ, А.А.СТРАЛЬЧОНАК, Г.І.СУРМАЧ, В.С.ТАНАЕЎ, А.А.ТРУСАЎ, У.С.УЛАШЧЫК, В.С.ФІЛІПОВІЧ, А.К.ФЯДОСАЎ, В.А.ФЯДОСІК, В.С.ЦІТОЎ, В.А.ЧАМЯРЫЦКІ, М.М.ЧАРНЯЎСКІ, Ю.М.ЧУРКО, В.Ф.ШМАТАЎ, Г.В.ШТЫХАЎ, М.Ф.ШУМЕЙКА, П.А.ШУПЛЯК, У.А.ШЧАРБАКОЎ, С.Я.ЯНЧАНКА.

НАВУКОВЫЯ КАНСУЛЬТАНТЫ:

М.Э.АБАЛА (Латвія), Т.І.АДУЛА, Р.М.АЛАДАВА, В.А.АНТАНЕВІЧ, Г.А.АНТАНЮК, А.А.БАРШЧЭЎСКІ (Польшча), В.І.БЕРНІК, А.М.БУЛЫКА, Л.І.БУРАК, М.С.ВАЙТОВІЧ, Г.В.ВАЛАБУЕВА, А.І.ВАЛОЖЫН, Т.У.ВАСІЛЕЦ, В.С.ГАПЕНКА, М.А.ГАРБУНОЎ, С.В.ГОВІН, Л.І.ГУРСКІ, А.А.ГУСАК, Л.Н.ДРОБАЎ, М.А.ДУБІЦКІ, М.І.ЖУКАЎ, Э.Р.ІОФЕ, Л.Р.КАЗЛОЎ, З.А.КАЗЛОЎСКАЯ, Л.В.КАЗЛОЎСКАЯ, У.К.КОРШУК, Г.І.КРАЎЦОВА, А.М.КУЛАГІН, А.А.ЛАЗАРЭВІЧ, А.П.ЛАПІНСКЕНЕ (Літва), М.В.ЛАЎРЫНОВІЧ, С.С.ЛАЎШУК, І.І.ЛЕАНОВІЧ, А.С.ЛЕАНЦЮК, У.К.ЛУКАШЭВІЧ, Э.А.ЛЯЎКОЎ, А.В.МАЦВЕЕЎ, У.А.МАЦЮХІН, В.Л.НАСЕВІЧ, М.Я.НІКІФАРАЎ, М.М.ПАГРАНОЎСКІ, С.А.ПАДОКШЫН, П.Ц.ПЕТРЫКАЎ, В.П.РАГОЙША, В.У.РАДЗІВІНОЎСКІ, Л.М.РАЖАНАВА, Г.В.РАТНІКАЎ, Г.Ф.РЫКОЎСКІ, А.П.САЛЬКОЎ, С.Н.САРЫНЯН (Арменія), І.І.СІНЧУК, Р.Б.СМОЛЬСКІ, М.Ф.СПІРЫДОНАЎ, А.Я.СУПРУН, Г.Г.СЯРГЕЕВА, А.А.ТОЗІК, Ю.А.ХАРЫН, Г.А.ЦЫХУН, В.А.ЧАБАНЕНКА (Украіна), А.А.ЧАЛЯДЗІНСКІ, І.А.ЧАРОТА, І.В.ШАБЛОЎСКАЯ, Л.М.ШАКУН, Г.Г.ШАНЬКО, Л.П.ШАХОЦЬКА, Я.Ф.ШУНЕЙКА, Г.М.ШЭЙКІН, М.Р.ЮРКЕВІЧ, Я.А.ЮХО, М.Г.ЯСАВЕЕЎ.

Мастацкае афармленне Э.Э.ЖАКЕВІЧА, А.М.ХІЛЬКЕВІЧА

0304760000—002
Б ——————— 1—95
М 318(03)—96

ISBN 985-11-0036-6 (т. 1)
ISBN 985-11-0035-8

© Выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя» імя Петруся Броўкі, 1996

## АД РЭДАКЦЫЙНАЙ КАЛЕГІІ

Універсальная Беларуская энцыклапедыя (БелЭн) выдаецца ў адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 23 жніўня 1993 г.

Першая універсальная Беларуская Савецкая Энцыклапедыя (БелСЭ) у 12 тамах выдадзена ў 1969—1975 гг. Яна ўключала каля 35 тысяч тэрмінаў, у якіх больш за 40 працэнтаў інфармацыі было прысвечана беларускай тэматыцы. БелСЭ на той час была выдатным дасягненнем навукі і культуры Беларусі.

За 20 гадоў, што мінулі з часу завяршэння выдання БелСЭ, адбыліся глыбокія змены ў свеце: на палітычнай карце планеты з'явіліся новыя незалежныя дзяржавы, у многіх краінах радыкальна памяняліся палітычныя і эканамічныя арыентацыі, формы праўлення, узніклі новыя партыі, грамадска-палітычныя рухі, лідэры. Рэспубліка Беларусь стала суверэннай незалежнай дзяржавай. Здабыткі ў прыродазнаўчых і грамадскіх навуках, ва ўсіх галінах культуры і мастацтва паўплывалі на змены прыярытэтных арыенціраў і кірункаў. Вырасла новае пакаленне выдатных дзеячаў ва ўсіх сферах грамадскага жыцця.

Творча выкарыстаўшы вопыт папярэдніх беларускіх энцыклапедычных выданняў, лепшых замежных энцыклапедый і даведнікаў, а таксама метадычныя прынцыпы адбору, апрацоўкі і сістэматызацыі інфармацыі, стваральнікі новай Беларускай энцыклапедыі паставілі сабе за мэту зрабіць яе вартай свайго народа, яго багатай і слаўнай гісторыі, яго дасягненняў і перспектыў развіцця.

Энцыклапедыю запланавана выдаць у 18 тамах (па 100 улікова-выдавецкіх аркушаў том). У ёй будзе змешчана каля 80 тысяч тэрмінаў.

БелЭн як універсальны сістэматызаваны даведнік змяшчае самыя разнастайныя звесткі па ўсіх галінах ведаў, назапашаных чалавецтвам, пра найважнейшыя падзеі гісторыі і сучаснага грамадска-палітычнага жыцця, пра выдатных дзеячаў усіх часоў і народаў. У той жа час пэўная перавага аддаецца навукова аргументаванаму асвятленню падзей, з'яў, фактаў, звязаных з Беларуссю, з яе выдатнымі дзеячамі ва ўсіх галінах палітычнага, эканамічнага, навуковага і культурнага жыцця. Зыходзячы з таго, што гэтым даведнікам будзе карыстацца пераважна насельніцтва Беларусі, многія агульныя звесткі ў ім падаюцца ў цеснай сувязі з Беларуссю — з яе прыродай, гісторыяй, эканомікай, навукай, культурай, мастацтвам і г.д. Такі падыход надае выданню адметнасць, арыгінальнасць і самастойную каштоўнасць, гарантуе яго практычную інфармацыйную карыснасць.

Беларуская энцыклапедыя — гэта ўсё пра Беларусь і ўвесь свет па-беларуску, гэта першая нацыянальная энцыклапедыя суверэннай дзяржавы Рэспублікі Беларусь, у стварэнні якой прымаюць удзел вядомыя вучоныя, літаратары, мастацтвазнаўцы і іншыя айчынныя, а ў шэрагу выпадкаў і замежныя спецыялісты розных галін ведаў.

Выданне багата ілюстравана каляровымі і чорна-белымі здымкамі, малюнкамі, картамі, схемамі.

Усе артыкулы ў энцыклапедыі размешчаны ў алфавітным парадку. Назвы артыкулаў даюцца пераважна ў адзіночным ліку: Абарог, Абеліск. Рассыпачныя або абагульняльныя артыкулы могуць мець форму множнага ліку: Ааміцэты, Арамеі.

Калі назва артыкула складаецца з прыметніка і назоўніка, то на прыметнік яна даецца ў тым выпадку, калі ўтварае з назоўнікам адно паняцце: Брэсцкая вобласць, Беларуская мова. У некаторых выпадках звычайны парадак слоў заменены так, што на першым месцы стаіць галоўнае па сэнсе слова (напр., Знакі матэматычныя).

У словах-назвах артыкулаў ставіцца націск, акрамя тых выпадкаў, калі ён прыпадае на літару «ё», якая ў беларускай мове пішацца толькі пад націскам. У складаных словах ставіцца толькі асноўны націск.

Калі пасля назвы артыкула, набранай чорным шрыфтам, праз коску або ў дужках (разрадкай) падаецца іншае слова (або некалькі слоў), то гэта азначае, што нароўні з першым, асноўным, тэрмінам ужываюцца сінонімы: Абраз, і к о н а.

Да тэрмінаў, якія ўваходзяць у назвы артыкулаў і з'яўляюцца бясспрэчнымі запазычаннямі з замежных моў, паказваецца (у дужках) этымалагічная даведка. Прыводзяцца таксама лацінскія назвы жывёл і раслін. Калі артыкулы, назвы якіх маюць аднолькавае паходжанне, стаяць побач, этымалагічная даведка даецца толькі пры адным з артыкулаў. Пасля назвы артыкулаў пра замежных дзеячаў, перыядычныя выданні і да т.п. ў дужках даецца адпаведнае (арыгінальнае) напісанне. Гэта правіла распаўсюджваецца толькі на мовы, якія карыстаюцца лацінскай графікай. Грэчаскія словы ў этымалагічных даведках даюцца ў лацінскай транскрыпцыі.

Звесткі пераменнага характару (колькасць жыхароў, эканамічныя паказчыкі) датуюцца годам, да якога адносяцца.

Даты падзей прыводзяцца ў новым каляндарным стылі. Падзеі, якія адносяцца да перыяду паміж Лютаўскай рэвалюцыяй 1917 і да ўвядзення новага стылю [1(14) лютага 1918 г.], пазначаюцца, як правіла, у двух стылях — старым і новым (апошні ў дужках).

У біяграфічных артыкулах пасля прозвішча, імя і імя па бацьку ў дужках даюцца даты нараджэння і смерці, а таксама звесткі пра месца нараджэння. Даты нараджэння і смерці паказваюцца, як правіла, у новым каляндарным стылі.

Адзінкі фізічных велічыняў паказваюцца пераважна ў Міжнароднай сістэме адзінак (СІ).

У энцыклапедыі ўжываецца сістэма спасылак. Назва артыкула, на якую спасылаюцца, набіраецца *курсівам*. Сістэма спасылак уключае паметы: «Гл. таксама», «Параўн.» і інш. Спасылкі на іншыя артыкулы даюцца толькі ў тых выпадках, калі ў артыкуле, на які спасылаюцца, ёсць дадатковая інфармацыя ці звесткі.

Дзеля эканоміі месца энцыклапедыя карыстаецца сістэмай скарачэння слоў. Побач з агульнапрынятымі ўжываюцца скарачэнні, спецыяльна распрацаваныя для гэтага выдання; спіс іх змешчаны ў канцы 1-га тома. Словы, якія складаюць назву артыкула, у тэксце гэтага артыкула пазначаюцца пачатковымі літарамі (напр., у артыкуле «Возера» — В., у артыкуле «Пінскі раён» — П.р.). Да лікаў, якія абазначаюць год, слова «год» ці «г.» не дадаецца (1861).

Значная частка артыкулаў мае бібліяграфію ў тэксце або пад тэкстам. У падтэкставай бібліяграфіі называюцца асноўныя творы дзеяча, якому прысвечаны артыкул, крыніцы і публікацыі асноўных дакументаў ці матэрыялаў, па якіх напісаны артыкул, і літаратура па пытанні, што асвятляецца.

Пад артыкуламі, у якіх абгрунтоўваюцца тэарэтычныя палажэнні ці ёсць новы фактычны матэрыял, незалежна ад іх тыпаў і памераў, ставіцца прозвішча аўтара.

# А

**А**, першая літара бел. алфавіта і інш. алфавітаў на лац. і рус. аснове. Графічнае напісанне паходзіць ад кірыліцкага а (аз), якое генетычна звязана з грэч. α (альфа), а праз яго з фінікійскім ∠ (алеф). У кірыліцы мела і лікавае значэнне 1, з дадатковымі значкамі а — 1000, а — 10 000, а — 100 000, а — 1 000 000. У сучаснай бел. мове літара «а» абазначае галосны гук «а» сярэдняга раду ніжняга пад'ёму.

**А...**, перад галоснымі **ан...** (грэч. а..., an... пачатковая частка слова са значэннем адмаўлення), прыстаўка ў замежных, пераважна грэч. паходжання, словах, якая абазначае адмаўленне ці адсутнасць якой-н. якасці, уласцівасці, напр. *авітамінозы*, *абіягенез*.

**АА...** (грэч. ōon яйцо), частка складаных слоў, якая паказвае на адносіны да яйца (яйцаклеткі), напр., *аагамія*, *ааспора*.

**ААГА́МІЯ** (ад *аа...* + *...гамія*), тып палавога працэсу (спосаб палавога размнажэння), пры якім зліваюцца розныя па памерах, форме і паводзінах *палавыя клеткі* (гаметы) і ўтвараецца *зігота*. Жаночая гамета — буйная, нерухомая (без жгуцікаў) яйцаклетка (яйцо). Мужчынская гамета (сперматазоід) — значна драбнейшая, звычайна рухомая (з 1 або некалькімі жгуцікамі), радзей без жгуцікаў (у некаторых ніжэйшых раслін і некаторых вышэйшых ракаў) або прадстаўлена толькі генератыўным ядром унутры пылковай трубкі (у многіх голанасенных і ўсіх пакрытанасенных). А. ўласціва шматклетачным жывёлам, вышэйшым раслінам і многім ніжэйшым.

**ААГЕНЕ́З** (ад *аа...* + *...генез*), паслядоўны працэс развіцця жаночай гаметы ад першаснай *палавой клеткі* да спелага яйца. Ахоплівае стадыі: размнажэння (павелічэнне колькасці дыплоідных палавых клетак — аагоніяў), росту аацытаў (павольны ў першай фазе, якая ў чалавека і жывёл можа працягвацца гадамі, у другой фазе — хуткі, з інтэнсіўным павелічэннем аб'ёмаў клетак) і іх выспявання (меятычнае дзяленне з утварэннем гаплоідных яйцаклетак, здольных да апладнення). У губак, некаторых кішачнаполасцевых і чарвей А. адбываецца ў любой частцы цела, у астатніх жывёл і чалавека лакалізаваны ў *яечніках*, у раслін — у *аагоніях*, *архегоніях* або *зародкавым мяшку*.

Аазіс Більма ў Аравійскай пустыні.

Ааліт.

**ААГО́НІЙ** (ад *аа...* + грэч. gonē нараджэнне), «жаночы» орган палавога размнажэння водарасцяў і некаторых грыбоў, якім уласціва *аагамія*. Звычайна складаецца з 1 клеткі, у якой утвараецца 1 або некалькі яйцаклетак. У харавых і некаторых інш. водарасцяў А. шматклетачны.

**АА́ЗІС** (грэч. oasis ад назвы егіп. г. Аасія), 1) месца ў пустынях і паўпустынях, забяспечанае вадой, з багатай расліннасцю. Адрозніваюць прыродныя А., якія ўтвараюцца на месцы выхаду крыніц, пры высокім узроўні грунтавых водаў, перыядычных разлівах рэк, і штучныя — пры арашэнні з артэзіянскіх калодзежаў, свідравін, арашальных каналаў і рэк. Маюць пл. ад соцень квадратных метраў да дзесяткаў тысяч квадратных кіламетраў. Найб. старажытныя Хатанскі ў Зах. Кітаі, Фаюмскі ў Афрыцы; самыя вялікія — густа населеныя раёны з інтэнсіўным земляробствам (напр., даліна Ніла ў Егіпце, Ферганская даліна ў Сярэдняй Азіі). 2) Свабодны ад лёду ўчастак ў Антарктыдзе (А. Бангера, Вікторыі).

**ААЛІ́ТЫ** [ад *аа...* +*літ*(ы)], шара- або эліпсападобныя мінер. ўтварэнні з вуглякіслага кальцыю, вокіслаў і сілікатаў жалеза і марганцу, кальцыту, даламіту і інш. Памер ад 0,05 да 25 мм, канцэнтрычна-шкарлупінападобнай, часам радыяльна-прамяністай і складанай будовы. Ядром А. могуць быць абломкі ракавін, пясчынкі і інш. Утвараюцца ў морах, цёплых крыніцах у выніку калоідна-хім. і біяхім. працэсаў. Трапляюцца ў *вапняках* і як разнавіднасць *жалезных рудаў*. На Беларусі ёсць у адкладах кембрыю, ардовіку, дэвону, юры і інш.

**А́АЛТА** (Aalto) Алвар (3.2.1898, г. Куартане, Фінляндыя — 11.5.1976), фінскі архітэктар; адзін са стваральнікаў фін. дызайна. Прадстаўнік *функцыяналізму* і *арганічнай архітэктуры*, ідэям якіх надаў нац. вытлумачэнне. Працаваў у

Фінляндыі, Швецыі, ЗША і інш. Спалучэннем жалезабетону і шкла з традыц. буд. матэрыялам (камень, цэгла, дрэва) дасягаў свабоды і выразнасці аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі будынкаў, узаемасувязі архітэктуры з ландшафтам і гар. асяроддзем (санаторый у Пайміо, 1929—33; палац «Фінляндыя» ў Хельсінкі, 1967—71).

*Літ.*: Гозак А.П. Алвар Аалто. М., 1976.

**А́АЛТАНЕН** (Aaltonen) Вяйнё Валдэмар (8.3.1894, г. Марціла, Фінляндыя — 30.5.1966), фінскі скульптар. Ганаровы чл. АМ СССР (з 1958). Працаваў у галіне фігурнай пластыкі («Бягун Паава Нурмі», бронза, 1924, Хельсінкі), псіхал. партрэта («Ян Сібеліус», 1935), манум.-дэкар. скульптуры (помнік пісьменніку А.Ківі ў Хельсінкі, 1934; помнік фінскім перасяленцам у Дэлавэры, ЗША, 1938). За гранітны манумент у г. Лахты «Мір» (1952) узнаг. Залатым медалём Сусв. Савета Міру (1953). Вядомы як жывапісец і тэатр. дэкаратар.

*Літ.*: Цагарелли И.Я. Вяйнё Аалтонен. М., 1961.

**ААМІЦЭ́ТЫ** (Oomycetes), клас (аддзел) ніжэйшых грыбоў. Уключае 4 парадкі: *сапралегніяльныя*, лептаміцтавыя (Leptomitales), лагенідыевыя (Lagenidiales), *пераназпаральныя*; 70 родаў, каля 550 відаў. Пашыраны ў Еўразіі, Афрыцы, Амерыцы. На Беларусі каля 100 відаў з парадкаў пераназпаральных і сапралегніяльных. Сапратрофы і паразіты. Водныя і наземныя формы. Некаторыя А. развіваюцца на рэштках раслін, трупах насякомых і інш. дробных жывёл. Шмат А. паразітуе на водарасцях, водных грыбах, чарвях, ікры, маляўках рыб і амфібій, вышэйшых раслінах. Вегетатыўнае цела (міцэлій) грыбоў пераважна добра развітае, шмат'ядравае, няклетачнае. Бясполае размнажэнне зааспорамі (маюць 2 жгуцікі), радзей канідыямі. Вынік палавога працэсу — *ааспора*, пераходзіць у стан спакою, у якім А. пераносяць неспрыяльныя ўмовы. Выклікаюць захворванні культ. раслін: фітафтароз бульбы, памідораў і інш. паслёнавых, караняед цукр. буракоў, чорную ножку розных с.-г. культур, мільдзю вінаграду і інш.

У адрозненне ад большасці інш. грыбоў, каркасным рэчывам клетачнай абалонкі з'яўляецца цэлюлоза і глюкан, а не хіцін, што сведчыць пра паходжанне А. ад продкаў жоўта-зялёных водарасцяў або ад флагелятаў.

*Літ.*: Жизнь растений. М., 1976. Т.2. С. 35—64.

**ААМЫ́НЬ** (партуг. Макао), тэрыторыя ва Усх. Азіі, на ўзбярэжжы Паўд.-Кітайскага м., у дэльце р. Сіцзян. Належыць Партугаліі. Уключае п-аў Аамынь і а-вы Тайпа і Калаане. Пл. 16 км². Адм. ц. — г. Аамынь. Нас. 497 тыс. чал. (1991); кітайцы (больш за 95%), партугальцы і інш. Афіц. мова партугальская. Вернікі пераважна католікі. Большая частка насельніцтва жыве ў г. Аамынь.

В.Аалтанен. Манумент «Мір» у г. Лахты.

А.Аалта. Палац «Фінляндыя» ў Хельсінкі.

Рэльеф узгорысты. Клімат мусонны; ападкаў 1800 мм за год, бываюць тайфуны.

Тэр. А. са стараж. часоў належала Кітаю, мела розныя назвы. Тут знаходзіўся палац кіт. імператрыцы — Магэ (Палата Матухны, адсюль назва Макао). У 14—17 ст. А. — гандл. гавань у пав. Сяншань (цяпер Чжуншань), прав. Гуандун. У 1553 у А. з'явіліся партугальцы, з 1555 яны арандавалі А., у 1557 стварылі адміністрацыю пры захаванні суверэнных правоў Кітая. У 1849 партуг. ўрад абвясціў А. незалежным ад Кітая. Паводле навязанага Кітаю ў 1887 Дагавора аб дружбе і гандлі Партугалія атрымала права на «вечнае кіраванне» А. У 1940 захоплены Японіяй. Пасля паражэння Японіі ў 2-й сусв. вайне — пад кантролем Партугаліі, якая ў 1951 абвясціла А. сваёй «заморскай правінцыяй» на чале з губернатарам. Урад КНР неаднаразова заяўляў, што А. — тэр. Кітая, і настойваў на вяртанні яго праз мірныя перагаворы. У 1987 прынята сумесная кіт.-партуг. заява, якой прадугледжана з 20.12.1999 аднаўленне суверэнных правоў КНР на А., а таксама дазволена стварыць асобны адм. раён у адпаведнасці з абвешчаным Пекінам прынцыпам «адна дзяржава — два лады». Паліт. партыі: Дэмакратычны цэнтр Аамыня, Асацыяцыя абароны Аамыня.

Аснова эканомікі — турызм і галіны, якія яго абслугоўваюць. Развіта вытв-сць тэкст., электронных вырабаў, феерверкаў, вырабаў са скуры, він, камфары. А. — буйны пасрэдніцкі цэнтр міжнар. гандл. і валютна-фін. аперацый. Пад с.-г. ўгоддзямі каля 2% тэрыторыі. Вырошчваюць агародніну, развіты птушкагадоўля і рыбалоўства. Асн. гандл. партнёры — Кітай, Сянган, ЗША і Канада. Экспартуе адзенне, тэкстыль, шоўк, прадукцыю саматужных промыслаў, тытунёвыя вырабы, чай, рыбу. Вял. ролю адыгрывае рээкспарт тавараў з Кітая. Імпартуе сыравіну, харч. прадукты, пітную ваду. А. вядомы як перавалачны пункт кантрабанднага гандлю золатам і опіумам. Ігральны бізнес. Марскі курорт. Паромная сувязь А. — Сянган. Штогод А. наведваюць 5 млн. турыстаў. Грашовая адзінка — патака. *Ю.В.Ляшковіч, У.С.Кошалеў.*

**ААН**, гл. *Арганізацыя Аб'яднаных Нацый.*

**А́АНЕС**, у шумера-акадскай міфалогіі першачалавек у абліччы паўрыбы-паўчалавека. Паводле *Бераса*, людзі жылі, як жывёлы, пакуль А. не выйшаў з мора і не навучыў жыхароў Вавілоніі пісьму, навукам, буд-ву гарадоў і храмаў, земляробству і інш.

**А́АРНЕ** (Aarne) Анці Аматус (5.12.1867, г. Б'ёрнеборг, Фінляндыя — 5.2.1925), фінскі фальклярыст; прадстаўнік т.зв. фінскай гісторыка-геагр. школы ў фальклярыстыцы. Распрацаваў і абгрунтаваў тэхн. прыёмы параўнальнага метаду, даў узоры яго дастасавання да казак, загадак, песень. Гал. працы: «Паказальнік казачных тыпаў» (1910), «Асновы параўнальнага вывучэння казак» (1913), «Параўнальнае вывучэнне загадак» (т. 1—3, 1918) і інш. На аснове яго паказальніка амер. казкавед С.Томпсан склаў свой «Паказальнік казачных тыпаў» (1928). Міжнар. сістэму класіфіка-

цыі казачных сюжэтаў А.—Томпсана выкарыстаў Л.Р.*Бараг* у паказальніку «Сюжэты і матывы беларускіх народных казак» (1978).

**А́АРЭ**, А р э (Aare), рака ў Швейцарыі, левы прыток Рэйна. Даўж. 295 км, пл. вадазбору 17,8 тыс. км$^2$. Пачынаецца ў Бернскіх Альпах, цячэ праз шэраг азёр, па Швейцарскім пласкагор'і. Сярэдні расход вады каля 560 м$^3$/с. Суднаходная да Тунскага воз. ГЭС. На А. — г. Берн.

**ААС** (OAS; Organisation de l'Armée Secrète сакрэтная ўзбр. арг-цыя), экстрэмісцкая арг-цыя, якая ўзнікла ў 1961 у Францыі і Алжыры ў час вызв. вайны алж. народа (1954—62). Каб не дапусціць абвяшчэння незалежнасці Алжыра, учыніла там у крас. 1961 путч, пасля правалу якога разгарнула крывавы тэрор у Алжыры і Францыі, выступіла супраць Франц. рэспублікі, 8.9.1961 арганізавала замах на ген. Ш. дэ *Голя*. Пасля падпісання *Эвіянскіх пагадненняў 1962* большасць франц. насельніцтва, нягледзячы на пагрозы ААС, тэрмінова пакінула Алжыр. 20.4.1962 у Алжыры арыштаваны адзін з кіраўнікоў ААС ген. Салан, што пазбавіла арг-цыю цэнтралізаванага кіраўніцтва. Пасля атрымання Алжырам незалежнасці (1962) ААС перамясцілася ў Францыю і суседнія з ёю краіны, неўзабаве была абясшкоджана.

**ААСПО́РА** (ад *аа...* + *спора*), спора некаторых ніжэйшых раслін (*ааміцэтаў*), што знаходзіцца ў спакоі. Утвараецца пры апладненні яйцаклеткі; мае значны запас пажыўных рэчываў і тоўстую шматслойную абалонку, якая ахоўвае ад неспрыяльных умоў (перасыханне вадаёма, холад і інш.). Пасля працяглага перыяду спакою прарастае зародкавым *спарангіем* або *міцэліем*.

**АА́ХЕ** (Oahe), вадасховішча ў ЗША, на р.Місуры. Пл. 1504 км$^2$, аб'ём 29,1 км$^3$, даўж. 400 км. Створана ў 1963 для энергет. мэтаў, суднаходства, барацьбы з паводкамі.

**АА́ХУ** (Oahu), востраў у Ціхім ак., у складзе Гавайскіх астравоў. Тэр. ЗША. Пл. 1574 км$^2$. Нас. 836,2 тыс. чал. (1990). Паверхня гарыстая (выш. да 1228 м), складзена з лавы. Клімат пасатны. Найб. населены і эканам. развіты востраў архіпелага. Важны трансп. вузел. Плантацыі ананасаў, цукр. трыснягу. Турызм. Гал. горад і адм. ц. штата Гаваі—Ганалулу. На востраве ваенна-марская база ЗША Пёрл-Харбар.

**«АБ ДВАНА́ЦЦАЦІ ПАКУ́ТАХ»**, бел. апрацоўка 15—16 ст. апокрыфа «*Хаджэнне Багародзіцы па пакутах*».

**АБА́** (Aba), горад на Пд Нігерыі, на р. Аба, пры перасячэнні шашы з чыг. Порт-Харкарт—Энугу. 264 тыс. ж. (1991). Трансп. вузел. Прамысл. і гандл. цэнтр раёна вырошчвання алейнай пальмы і вытв-сці алею. Прадпрыемствы тэкст., фармацэўтычнай, мылаварнай, па вырабе пластмас, цэментнай, абутковай, парфумернай і вінаробчай прам-сці.

**АБА́БАК**, тое, што *падбярозавік*.

**АБА́Б'Е**, возера ў Беларусі, у Браслаўскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Друйка. Пл. 1,4 км$^2$. Даўж. 3,2 км, найб. шыр. 0,8 км, найб. глыб. 2,9 м. Пл. вадазбору 32,8 км$^2$. Схілы выш. да 4 м, парослыя лесам і хмызняком, на З разараныя. Берагі нізкія. Дно ўздоўж берагоў пясчанае, глыбей укрыта сапрапелем, зарастае. Злучана ручаямі з азёрамі Дубра, Вялікая Ельня, Дуброк, з возера вышэйшае р. Абабіца. У выніку меліярацыі ўзровень возера панізіўся на 1 м.

**АБАВЯ́ЗАК**, маральнае патрабаванне; неабходнасць выканання чалавекам пэўных дзеянняў, якія вызначаюцца грамадствам і ў аднолькавай ступені адносяцца да ўсіх яго членаў. Па значэнні блізкі да паняцця доўг, у якім

Возера **Абаб'е**.

агульны, універсальны характар грамадска значных патрабаванняў ператвараецца ў асабістую задачу канкрэтнага індывіда, абумоўленую акалічнасцямі яго жыцця. Да асн. грамадзянскіх А., зафіксаваных у Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, адносяцца: выкананне законаў рэспублікі, павага да яе нац. традыцый, годнасці, правоў, законных інтарэсаў інш. асоб; зберажэнне прыроды, культ. спадчыны, абарона Радзімы, клопат пра дзяцей, бацькоў і інш.

*В.А.Паўлоўская.*

**АБАВЯ́ЗАК ВО́ІНСКІ**, абавязак грамадзян абараняць сваю Айчыну, навучацца ваен. справе і несці ваен. службу ў складзе ўзбр. сіл і інш. вайск. фарміраванняў. Замацаваны Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, рэгулюецца Законам «Аб усеагульным воінскім абавязку і ваеннай службе» ад 5.11.1992. Мае адносіны да грамадзян, органаў дзярж. улады і кіравання, прадпрыемстваў, устаноў і арг-цый незалежна ад форм уласнасці і ўмоў гаспадарання. А.в. не пашыраецца на замежных грамадзян, якія жывуць на тэр. Беларусі, і асоб без грамадзянства. Гл. таксама *Воінская павіннасць*.

**АБАВЯ́ЗАК ДАКА́ЗВАЦЬ** (лац. onus probandi) у с у д а в о д с т в е, патрабаванне да ўдзельнікаў працэсу даказаць і абгрунтаваць наяўнасць тых ці інш. акалічнасцяў, істотных для вырашэння справы. На Беларусі А.д. у к р ы м і н. п р а ц э с е ляжыць на дзярж. органах і службовых асобах, якія абвінавачваюць асобу ў злачынстве. Суд, пракурор, следчы і асоба, якая праводзіць дазнанне, абавязаны выявіць акалічнасці, што выкрываюць ці апраўдваюць абвінавачанага, а таксама абцяжваюць ці змякчаюць яго віну. Яны не маюць права перакладваць А.д. на абвінавачанага (падсуднага), і ён не павінен даказваць сваю невінаватасць. У ц ы в і л ь н ы м п р а ц э с е кожны бок павінен даказаць акалічнасці, на якія ён спасылаецца як на падставу сваіх патрабаванняў і пярэчанняў. Напр., ісцец абавязаны даказаць і абгрунтаваць факты, якія складаюць падставу іску. Адказчык абавязаны даказаць факты, якія пацвярджаюць яго пярэчанні супраць іску. Характэрная рыса суд. даказвання ў цывільным працэсе — тое, што не толькі бакі і інш. асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, абавязаны прадстаўляць доказы ў пацвярджэнне сваіх патрабаванняў і пярэчанняў, але і суд з мэтай высвятлення аб'ектыўнай ісціны і вынясення правасуднага рашэння ў неабходных выпадках павінен збіраць доказы па сваёй ініцыятыве.

*І.І.Пацяружа.*

**АБАВЯ́ЗАНЫЯ СЯЛЯ́НЕ**, прыватнаўласніцкія сяляне ў Рас. імперыі, якіх паводле ўказа 2.4.1842 памешчык меў права вызваляць ад прыгоннай залежнасці, надзяляць зямлёй у часовае карыстанне, «абавязваючы» павіннасцямі ў форме *аброку* або *паншчыны*. Указ не вызначаў памераў зямельных надзелаў, абавязкаў сялян і не абмяжоўваў улады памешчыкаў над імі. Таму становішча А.с. засталося такое, як і ў прыгонных. З 10 млн. прыгонных сялян мужч. полу да 1855 у катэгорыю абавязаных пераведзена 24 тыс.

**АБАВЯЗА́ЦЕЛЬНАЕ ПРА́ВА**, сукупнасць цывільна-прававых нормаў, якія рэгулююць узнікненне, выкананне і спыненне *абавязацельстваў* і адказнасць за іх парушэнні. А.п. Рэспублікі Беларусь выкладаецца ў аднайм. раздзеле Цывільнага кодэкса і інш. нарматыўных актах (некаторыя абавязацельствы рэгламентуюцца правіламі і палажэннямі, устаноўленымі мін-вамі і ведамствамі). Складаецца з агульнай і асаблівай частак. У агульнай ч. змешчаны нормы, якія вызначаюць паняцце абавязацельстваў, падставы да іх узнікнення, змест і парадак выканання і інш., а таксама падставы да спынення абавязацельстваў і адказнасць за іх парушэнне. Нормы асаблівай часткі рэгулююць асобныя

віды абавязацельстваў (купля-продаж, мена, дарэнне, падрад, пастаўка і інш.). *Н.А.Карповіч.*

**АБАВЯЗА́ЦЕЛЬСТВА**, від цывільных праваадносін, у якіх адзін бок (даўжнік) абавязаны зрабіць на карысць другога боку (крэдытора) пэўныя дзеянні (перадаць маёмасць, выплаціць грошы, выканаць работу і інш.) або ўстрымацца ад іх, а крэдытор мае права патрабаваць ад даўжніка выканання яго абавязку. Крэдыторам і даўжніком могуць быць грамадзяне і юрыд. асобы (прадпрыемствы, установы, акц. т-вы і інш.) любой формы ўласнасці. А. могуць фіксавацца ў пагадненнях аб здзелках, у дагаворах, вынікаць з дзеючых заканадаўчых і адм. актаў і інш. нарматыўных дакументаў або абставін.

**АБАВЯЗКО́ВАЕ НАВУЧА́ННЕ**, гл. *Усеагульнае абавязковае навучанне.*

**АБАВЯЗКО́ВЫЯ ПАСТАНО́ВЫ**, у Расійскай імперыі ў 2-й пал. 19—пач. 20 ст. акты службовых асоб (ген.-губернатараў, граданачальнікаў), якія выдаваліся дыскрэцыйна (у залежнасці ад асабістага меркавання) і змяшчалі юрыд. санкцыі. Прымаліся для барацьбы з рэв. рухам. Паводле палажэння ад 13.7.1876 губернатары атрымалі права выдаваць А.п. аб забароне сходаў, органаў друку і інш. Палажэнне ад 14.8.1881 акрэслівала паўнамоцтвы службовых асоб на прыняцце А.п. у мясцовасцях, аб'яўленых на *асобым становішчы*, пазней губернатары атрымалі права выдаваць А.п. тэрмінам на 1 год і ў мясцовасцях, дзе выключнага становішча не было. У 1904—07 паўнамоцтвы на А.п. мелі мінскі і магілёўскі, у 1909—13 — віленскі, віцебскі, мінскі, магілёўскі губернатары. А.п. існавалі да Лют. рэвалюцыі 1917.

*Літ.*: Гессен В.М. Исключительное положение. Спб., 1908. *А.Я.Сукала.*

**АБАВЯЗКО́ВЫЯ РЭЗЕ́РВЫ** банкаў, норма захоўвання грашовых сродкаў камерцыйных банкаў і інш. крэдытных устаноў на спец. рэзервовых рахунках у цэнтр. банку. Прызначаюцца для забеспячэння ліквіднасці, дэпазітнай запазычанасці і інш. Норма А.р. устанаўліваецца цэнтр. банкам, і яе парушэнне караецца штрафнымі санкцыямі.

**АБАВЯ́Н** Хачатур Авецікавіч (14.4.1805, с. Канакер, каля г. Ерэван — 14.4.1848), армянскі пісьменнік, асветнік-дэмакрат, заснавальнік новай арм. літаратуры і літ. мовы, педагог. Класік арм. л-ры. Выступаў за нац.-культурнае і паліт. адраджэнне армян, супраць сярэдневяковых схаластычных метадаў, дагматызму і фармалізму ў школьным навучанні. Першы нац. гіст. раман «Раны Арменіі» (1841, выд. 1858)— пра вызв. барацьбу арм. народа ў перыяд руска-іранскай вайны 1826—28. Пед. погляды выказаў у кн. «Перадсцежжа» (1838), рамане «Гісторыя Тыграна, ці Маральнае настаўленне для армянскіх дзяцей» (выд. 1941). Аўтар навук.-маст. твораў «Адкрыццё Амерыкі» (выд. 1940), «Курды» (1948) і інш.

**АБАГАЧЭ́ННЕ КАРЫ́СНЫХ ВЫКАПНЯЎ**, сукупнасць працэсаў і метадаў канцэнтрацыі мінералаў пры пач. перапрацоўцы цвёрдых карысных выкапняў. Праводзіцца пры малой колькасці каштоўных кампанентаў у сыравіне або наяўнасці ў ёй шкодных прымесяў. Пры абагачэнні адбываецца мех. раздзяленне мінералаў, атрыманне канчатковых прадуктаў (напр., сільвініту, азбесту, графіту і інш.), канцэнтратаў, прыдатных на металургічную, хім. і інш. перапрацоўку і адходы. Пры А.к.в. з руд вылучаюць ад 60 да 95% карысных кампанентаў (з малібдэнавых руд з 0,1% Mo атрымліваюць 50%-ны канцэнтрат). Асн. метады абагачэння — *флатацыя*, гравітацыйнае абагачэнне, магнітная і эл. сепарацыя. Практыкуецца таксама абагачэнне па вонкавых прыкметах (сартаванне мінералаў па колеры і бляску), радыеметрычнае (па прыроднай ці наведзенай радыеактыўнасці), на ліпкіх паверхнях (наліпанне алмазаў з пульпы на паверхню са слоем тлушчу) і інш. Метады А.к.в. выкарыстоўваюцца паасобку або ў розных спалучэннях. Флатацыяй вылучаюць хлорысты калій з сільвінітавай руды на калійных камбінатах Беларусі. Пры гравітацыйным абагачэнні выкарыстоўваюць розную шчыльнасць мінералаў. Магнітнай сепарацыяй раздзяляюць матэрыялы рознай магнітнай успрымальнасці (напр., жал. руду). Эл. метады заснаваны на неаднолькавай электраправоднасці часцінак і рознай іх здольнасці набываць эл. зарады. А.к.в. павялічвае прадукцыйнасць і эфектыўнасць металург. і хім. працэсаў. *М.Я.Зусь.*

**АБАГАЧЭ́ННЕ ЯДЗЕРНАГА ПА́ЛІВА**, штучнае павелічэнне колькасці ізатопа урану $^{235}U$, якому ўласціва дзяленне, у сумесі інш. яго ізатопаў. Бывае слабае (да 2%, дае *ядзернае паліва* для энергет. рэактараў) і высокае (да 92%, для даследчых і трансп. рэактараў гэтага тыпу). Робіцца фіз. метадамі раздзялення ізатопаў у многаступеньчатых апаратах з выкарыстаннем газавай ці тэрмічнай дыфузіі, цэнтрыфугавання і інш. метадаў, якія грунтуюцца на розніцы мас атамаў ізатопаў. А.я.п. наз. таксама павышэнне (простым дабаўленнем) у ядз. палівe колькасці падзельнага ізатопа.

**АБАГУЛЬНЕ́ННЕ**, пераход на больш высокую ступень *абстракцыі* праз выяўленне агульных прыкмет (уласцівасцей, адносін, тэндэнцый развіцця і г.д.). Робіцца на ўзроўнях: эмпірычнага матэрыялу (выпрацоўка паняццяў, якія выяўляюць тоеснасць ці падабенства двух і больш прадметаў); ужо выпрацаваных паняццяў і суджэнняў (пераход да больш шырокіх паняццяў); «сістэм паняццяў» — тэорый (напр., пераход ад геаметрыі Эўкліда да геаметрыі Лабачэўскага). А. звязана таксама з працэсам *аналізу*, *сінтэзу*, параўнання з рознымі індукцыйнымі працэдурамі. Атрыманне абагульненых ведаў азначае больш глыбокае пранікненне ў сутнасць рэчаіснасці. Процілегласць А. — абмежаванне.

**АБА́ДА** (Abbado) Клаўдзіо (н. 26.6.1933, Мілан), італьянскі дырыжор і піяніст. Скончыў Міланскую кансерваторыю па класах фп. (1953) і кампазіцыі (1955). Выступаў як піяніст. З 1969 дырыжор, муз. і маст. кіраўнік (да 1986) т-ра «Ла Скала», з 1971 адначасова гал. дырыжор Венскага філарманічнага, з 1979 Лонданскага сімфанічнага, з 1989 Берлінскага філарманічнага аркестраў. Кіраўнік створанага ў 1982 філарманічнага аркестра «Ла Скала». З 1986 маст. кіраўнік Венскай дзярж. оперы. Лаўрэат міжнар. конкурсу маладых дырыжораў імя Дз.Мітропуласа (Нью-Йорк, 1963).

**АБАДА́Н**, горад на ПдЗ Ірана, у Хузістане. 387 тыс. ж. (1993). Марскі порт на р. Шат-эль-Араб, за 50 км ад яе ўпадзення ў Персідскі заліў. Трансп. вузел. Чыгункай злучаны з Тэгеранам. Буйны цэнтр нафтаперапрацоўкі: нафтаперапр. з-д, нафтахім. комплекс па выпуску аміяку, звадкаванага газу і інш. Нафтаправоды ў Тэгеран, Ісфахан, Бендэр-Шахпур, на в-аў Харк у Персідскім заліве.

**АБАДО́ЎЦЫ**, вёска ў Беларусі, у Ільянскім с/с Вілейскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса «Абадоўцы». За 30 км на У ад Вілейкі, 92 км ад Мінска, 35 км ад чыг. ст. Уша. 429 ж., 143 двары (1995). Базавая школа, клуб, бібліятэка.

**АБАДРЫ́ТЫ**, племя палабскіх славян, гл. ў арт. *Бодрычы.*

**АБАЗІ́НСКАЯ МО́ВА**, адна з *іберыйска-каўказскіх моў* (абхаза-адыгейская група). Пашырана пераважна ў *Карачаева-Чэркесіі*, а таксама ў *Адыгеі*. Мае 2 дыялекты: тапанцкі (аснова літ. мовы) і ашхарскі, блізкі да *абхазскай мовы*. Ад абхазскай мовы адрозніваецца фанетыкай, наяўнасцю ўказальных займеннікаў, парадкавых і кратных лічэбнікаў, выкарыстаннем паслялогаў, формамі часу і ладу ў дзеясловах і інш. Для А.м. характэрны шматлікія запазычанні з *кабардзіна-чэркескай мовы*. Пісьменства створана ў 1932—33 на лац. аснове, з 1938 пераведзена на рус. графіку.

*Літ.*: Сердюченко Г.П. Язык абазин. М., 1955.

**АБАЗІ́НЫ** (саманазва абаза), народ у *Карачаева-Чэркесіі* і *Адыгеі*. 34 тыс. чал. (1989). Частка — у Турцыі. Гавораць на *абазінскай мове*. Вернікі пераважна мусульмане-суніты.

**АБАЗО́ЎСКІ** Канстанцін Антонавіч (1.10.1919, в. Абухава Бешанковіцкага р-на Віцебскай вобл. — 26.10.1944), Герой Сав. Саюза (1944). Скончыў Віцебскі пед. ін-т (1938), авіяц. вучылішча (1943). У Вял. Айч. вайну лётчык, удзельнік вызвалення Паўн. Каўказа, Крыма, Прыбалтыкі. Зрабіў 106 баявых вылетаў, знішчыў 16 самалётаў, 11 танкаў, 139 аўтамабіляў, 26 зенітных установак, 2 склады з боепрыпасамі. Загінуў у Прыбалтыцы. У г.п. Бешанковічы яму пастаўлены помнік.

**АБА́Й КУНАНБА́ЕЎ** (10.8.1845, в. Караул Абайскага р-на, Казахстан — 6.7.1904), казахскі паэт-асветнік, заснавальнік новай пісьмовай казахскай літаратуры. Вывучаў араб., перс. і інш. мовы. Светапогляд А.К. фарміраваўся пад уплывам гуманіст. ідэй паэтаў і вучоных Усходу, рус. класічнай л-ры і стараж.-грэч. філасафаў. У лірычных і сатыр. вершах выступаў супраць сац. зла, невуцтва, старых звычаяў. У паэмах «Мастуд» (1887), «Іскандэр», «Сказанне пра Азіма» выкарыстаў усх. сюжэты. У кн. прозы «Павучанні» выклаў этычныя і філас. погляды. Увёў новыя формы верша (6- і 8-радкоўе). Жыццю А.К. прысвечаны раман-эпапея М.Аўэзава «Шлях Абая».

*Літ.*: Ауэзов М.О. Абай Кунанбаев: Статьи и исследования. Алма-Ата, 1967.

**АБА́К**, а б а к а [ад грэч. abax (abakos) дошка], 1) дошка для арыфм. вылічэнняў, якой карысталіся ў Стараж. Грэцыі і Рыме, пазней у Зах. Еўропе (да 18 ст.). Першапачаткова гладкая дошка, пасыпаная пяском і падзеленая на палосы, у якіх размяшчаліся лічыльныя маркі (каменьчыкі, косці, манеты). У краінах Д. Усходу карысталіся кіт. А. — с у а н п а н а м, у Расіі — л і ч ы л ь н і к а м і. 2) У н а м а г р а ф і і А. — спец. лічыльныя *намаграмы*. 3) У а р х і т э к т у р ы — плоская, квадратная ў плане пліта, на якую апіраецца *антаблемент*; верхняя частка *капітэлі*. Як элемент класічнага арх. *ордэра* з'явіўся ў Стараж. Грэцыі. У розных тыпах ордэра набываў своеасаблівую маст. апрацоўку: прафіляванне і арнаментыку ў выглядзе іонікаў у іанічным, ляпныя разеткі ў карынфскім і кампазітным ордэрах. Пашыраны пераважна ў манум. мураваных і драўляных палацавых і грамадскіх збудаваннях класіцызму.

**АБАКА́Н**, горад у Расіі, сталіца *Хакасіі*, у цэнтр. ч. Мінусінскай катлавіны. Засн. ў 1675. 158,2 тыс. ж. (1994). Прыстань на р. Абакан. Вузел чыг. ліній і аўтадарог. Машынабудаванне (вытв-сць вагонаў, кантэйнераў); дрэваапр., лёгкая, харч. прам-сць.

**АБАКА́НСКАЕ РАДО́ВІШЧА** ж а л е з а р у д н а е, на Пд Краснаярскага краю Рас. Федэрацыі. Распрацоўваецца з 1867. Кантактнае радовішча (скарны) магнетытавых руд. Разведаныя запасы 160 млн. т з 42,2% жалеза. Цэнтр здабычы — г. Абаза.

**А́БАЛА** (Ābola) Мірдза Эдуардаўна (н. 23.2.1923, воласць Світэнэ, Латвія), латышскі літаратуразнавец. Д-р філал. н. (1956). Скончыла Латвійскі ун-т (1949). Даследчыца творчасці Я.Судрабкална, бел.-лат. гіст. і літ. сувязей (кн. «Дружба, умацаваная ў вяках», з Д.Вікснай, 1977). Прымала ўдзел у складанні навук. збору твораў Я.Райніса (т. 1—3, 5—7, 17; варыянтаў 1—3; Дзярж. прэмія Латвіі 1986). Аўтар прац «Райніс і беларусы» (1975), «Ян Судрабкалн і беларусы» (1977). Складальнік лат.-бел. і бел.-лат. слоўніка. На лат. мову пераклала зб. прозы У.Караткевіча «Чазенія» (1976), шэраг апавяданняў Я.Коласа і інш. Прэзідэнт Латышскай асацыяцыі беларусістаў (з 1991).

**АБАЛА́КАВЫ**, расійскія альпіністы, браты. В і т а л ь М і х а й л а в і ч (13.1.1906, Масква — 26.5.1986), інжынер-канструктар, засл. майстар альпінізму (1934), засл. майстар спорту

Абак.

СССР (1943), засл. трэнер СССР (1961). Зрабіў першаўзыходжанне на пік Леніна (7134 м, Памір, 1934). Я ў г е н М і х а й л а в і ч (17.2.1907, Масква — 24.3.1948), скульптар, засл. майстар альпінізму (1934). Зрабіў першаўзыходжанне на вышэйшую вяршыню б. СССР — пік Камунізму (7495 м, Памір, 1933). Яго імем названа адна з вяршынь на Памірах.

**АБАЛЕ́НСКІ** Леанід Ягоравіч (літ. псеўд. М.І.К р а с о в; 9.3.1845—23.9.1906), рус. філосаф, сацыёлаг. У 1860-я г. вывучаў юрыспрудэнцыю ў Маскоўскім і Пецярбургскім ун-тах. Супрацоўнічаў у час. «Мысль», «Русское богатство» і інш. Распрацоўваў праблемы эстэтыкі, сацыялогіі, маралі асобы і грамадскага развіцця. Лічыў, што ўяўленне пра з'явы аб'ектыўнага свету не тоесныя з аб'ектыўнай рэальнасцю; свядомая воля заўсёды матывавана. На яго думку, філасофія павінна ахопліваць і вобласць пачуццяў, і сутнасць свету; матэрыялізм і пазітывізм не задавальняюць гэтых патрабаванняў, таму што даюць толькі адзін з элементаў свету, яго матэрыяльны падмурак замест цэлага.

*Тв.*: Развитие чувствований и опыт их новой классификации. Спб., 1884; Научные основы красоты и искусства. Спб., 1902; История мысли: Опыт критич. философии. Спб., 1907.

**АБАЛЕ́НСКІ** Яўген Пятровіч (6.10.1796, г. Наваміргарад, Украіна — 26.2.1865), дзекабрыст. Князь, сын тульскага губернатара. Паручнік лейб-гвардыі Фінляндскага палка. Чл. «*Саюза працвітання*». Адзін з заснавальнікаў *Паўночнага таварыства дзекабрыстаў*, з 1823 чл. яго думы. Рэспубліканец. Нач. штаба паўстання на Сенацкай плошчы

Абай Кунанбаеў.

14.12.1825. Прыгавораны да пажыццёвай катаргі. Пасля амністыі 1856 жыў у Калузе. Удзельнічаў у падрыхтоўцы сял. рэформы 1861. Аўтар «Успамінаў».

**АБАЛІЦЫЯНІ́ЗМ** [ад лац. abolitio (abolitionis) адмена, скасаванне], 1) грамадскі рух за скасаванне пэўнага закону. 2) Рух у ЗША у 18—19 ст. за ліквідацыю рабства неграў. Садзейнічаў набліжэнню грамадз. вайны 1861—65, перамозе ў ёй рэсп. Поўначы над рабаўладальніцкім Поўднем і прыняццю ў 1865 папраўкі да канстытуцыі ЗША аб скасаванні рабства. 3) Барацьба за скасаванне рабства ў калоніях Англіі, Францыі і інш. еўрап. краінах ў 18—19 ст.

**АБАЛІЦЫЯНІ́СЦКАЯ ЛІТАРАТУ́РА**, літаратура 1830—60-х г. у ЗША, звязаная з грамадска-паліт. рухам за адмену рабства (гл. *Абаліцыянізм*). Пачынальнік і буйнейшы дзеяч руху — журналіст і паэт У.Л.Гарысан, выдавец газ. «Liberator» («Вызваліцель», выходзіла ў Бостане ў 1831—65). Найб. вядомыя творы А.л. — раманы Р.Хілдрэта «Раб, або Успаміны Арчы Мура» (1836); Г.Бічэр-Стоу «Хаціна дзядзькі Тома» (1852). Тэмы і ідэі абаліцыянізму знайшлі адлюстраванне ў творчасці амер. пісьменнікаў Г.У.Лангфела, Р.У.Эмерсана, У.Уітмена і інш.

**АБА́ЛКІН** Леанід Іванавіч (н. 5.5.1930, Масква), вучоны-эканаміст, сав. дзярж. дзеяч. Акад. АН СССР (1987, чл.-кар. 1984), акад. Рас. АН (1991). Скончыў Маскоўскі ін-т нар. гаспадаркі імя Пляханава (1952). З 1956 на навукова-пед. рабоце. З 1986 дырэктар Ін-та эканомікі Рас. АН, адначасова ў 1989—91 нам. старшыні СМ СССР, старшыня дзярж. камісіі СМ СССР па эканам. рэформе. Навук. працы па праблемах палітэканоміі сацыялізму, удасканалення гасп. механізму, фарміравання канцэпцыі пераходу да рынку.

*Тв.*: Политическая экономия и экономическая политика. М., 1970; Новый тип экономического мышления. М., 1987; Перестройка: пути и проблемы. М., 1988.

**АБАЛО́НКА** клеткі, клетачная сценка, структурнае ўтварэнне на перыферыі *клеткі*, якое забяспечвае ёй трываласць, форму, засцерагае пратапласт ад вонкавых уздзеянняў і ўдзельнічае ў абмене рэчываў. А. клетак раслін знаходзіцца за межамі клетачнай мембраны. Яе аснову (каркас) складаюць упарадкаваныя, паслойна перакрыжаваныя мікрафібрылы з малекул цэлюлозы, апушчаныя ў аморфную масу (матрыкс) з геміцэлюлозы і пекцінавых рэчываў.

Звычайна адрозніваюць А. першасныя і другасныя. Першасныя (тонкія, з неўпарадкаваным размяшчэннем фібрылаў) больш уласцівы маладым клеткам (у іх найбольш пекцінаў і геміцэлюлозы, яны могуць расці). Знутры на першасную А. адкладваецца цвёрдая і пругкая (за кошт павышанай колькасці цэлюлозы) другасная А. Яна мае паслойную будову і вызначае таўшчыню клетачнай сценкі, у большасці выпадкаў мае поры, праз якія праходзяць *плазмадэсмы*. У большасці раслін у А. адбываюцца хім. працэсы, якія вядуць да іх адраўнення, акаркавення, кутынізацыі, аслізнення, мінералізацыі, утварэння *камедзяў*. А. клетак жывёл — спецыялізаваны слой на іх паверхні, які складаецца з плазматычнай мембраны (плазмалемы) і ўласна А. Плазмалема ёсць ва ўсіх клетках, пабудавана з бялкоў і ліпідаў, актыўна ўдзельнічае ў абмене рэчываў, можа ўтвараць нарасці (мікраварсінкі) і ўцягванні. Уласна А. ёсць не ва ўсіх жывёльных клетках. Яна можа ўтварацца самой клеткай і за кошт сакрэтаў клетак, складаецца пераважна з вугляводаў і іх злучэнняў з бялкамі, здольная выконваць ролю вонкавага шкілета клеткі (пелікула прасцейшых, хіцінавая кутыкула членістаногіх), аховы ад вонкавых уздзеянняў (шматслойная А. яйцаклетак, А. цыстаў) і інш. функцыі.

Тыпы паверхняў **абалонак** у будаўніцтве: *1* — дадатнай, *2* — адмоўнай, *3* — нулявой крывізны.

**АБАЛО́НКА** ў будаўніцтве і тэхніцы, прасторавая канструкцыя, абмежаваная 2 крывалінейнымі паверхнямі, адлегласць паміж якімі (таўшчыня А.) малая ў параўнанні з астатнімі памерамі. У залежнасці ад геаметрыі паверхні адрозніваюць А.: дадатнай (сферычныя, эліпсоідныя), нулявой (цыліндрычныя, канічныя) і адмоўнай (гіпербалічныя) крывізны. Бываюць тонка- і таўстасценныя; адна-, двух- і шматслойныя; маналітныя, зборныя, зборна-маналітныя і інш. Вырабляюць А. з жалезабетону, сталі, лёгкіх сплаваў, пластмасы, драўніны і інш. Выкарыстоўваюць у пакрыццях і перакрыццях будынкаў, у канструкцыях лятальных апаратаў, ракет, суднаў, рэзервуараў, частак машын і інш.

**АБАЛО́НКАВАЯ ФО́РМА**, ліцейная форма разавага выкарыстання з дзвюх змацаваных рэльефных паўформаў з таўшчынёй сценак 6—10 мм. Вырабляецца на аўтам. і паўаўтам. машынах з сумесі дробнага кварцавага пяску і фенола-фармальдэгіднай парашкападобнай тэрмарэактыўнай смалы. Пры награванні смала плавіцца і абвалаквае пясчынкі, пры далейшым награванні — цвярдзее і звязвае пясок у трывалую абалонку. Паўформы змацоўваюць па фіксатарах з дапамогай скобаў, шрубцынгаў ці склейваюць. У А.ф. атрымліваюць адліўкі масай да 100 кг. Расход фармовачнай сумесі ў 8—10 разоў меншы, чым пры ліцці ў пясчана-гліністыя формы.



Абалонкавая форма.



Да арт. **Абалонкі**: *1* — бочачнік; *2* — пірасома; *3* — калонія сальпаў; *4* — асцыдыя халацынтыя гузакаватая.

**АБАЛО́НКІ ЗЯМЛІ́**, гл. *Геасферы*.

**АБАЛО́ННІКІ**, лічынкавахордавыя (Tunicata, Urochorda), падтып хордавых жывёл. Аб'ядноўвае 5 кл.: *апендыкулярыі*, бочачнікі (Cyclomyaria), *асцыдыі*, *сальпы*, агняцелкі, або пірасомы (Pirosomata). Каля 1,5 тыс. відаў. Пашыраны ўсюды ў морах і акіянах.

Даўж. ад 0,3—50 см да 30 м (калоніі пірасом). Цела мяшэчка- або бочачкападобнае, укрытае тунікай (абалонкай), утворанай выдзяленнем вонкавага эпітэлію. Хорда ёсць толькі ў лічынкавых формаў (акрамя апендыкулярый). Гермафрадыты. Размнажэнне палавое і бясполае.

**АБАЛЯ́НКА**, рака на У Беларусі ў Талачынскім, Сенненскім р-нах Віцебскай вобл., левы прыток Лучосы. Даўж. 89 км. Пл. вадазбору каля 810 км$^2$. Пачынаецца на Аршанскім узв., цячэ па Чашніцкай раўніне і Лучоскай нізіне. Даліна шыр. 0,6—0,8 км, у ніж. цячэнні да 2 км. Пойма двухбаковая, шыр. ад 0,2 да 0,3 км. Рэчышча звілістае, шыр. 5—10 м. Каля 70% гадавога сцёку прыпадае на вясну. У Талачынскім р-не на рацэ плаціна. Водапрыёмнік меліярац. сістэм.

**А́БАНА-ТЭ́РМЕ** (Ábano Terme), бальнеагразевы курорт у Італіі. На Венецыянскай нізіне, на ПдЗ ад г. Падуя. Вядомы з часоў Стараж. Рыма, адраджэнне пачалося ў 13 ст. Каля 150 крыніц тэрмальных (да 85 °С) радонавых водаў, сульфідныя грязі выкарыстоўваюцца пры лячэнні хвароб органаў дыхання, руху і апоры, нерв. сістэмы і гінекалагічнай сферы. Гасцініцы і пансіянаты.

**АБАНДО́Н** (франц. abandon) у марскім праве, права страхавальніка адмовіцца ад сваіх правоў на застрахаваную маёмасць на карысць страхоўшчыка і атрымаць поўную страхавую суму. Як правіла, робіцца ў выпадку прапажы, гібелі маёмасці, немэтазгоднасці аднаўлення ці рамонту судна. Заява аб А. павінна паступіць ад страхавальніка на працягу 6 месяцаў з моманту ўзнікнення для гэтага падстаў. Можа быць зроблена і ў аднабаковым парадку без пацвярджэння страхоўшчыка. У выніку А. да страхоўшчыка пераходзяць усе правы на застрахаваную маёмасць.

**АБАНЕМЕ́НТ** (франц. abonnement), права юрыдычнай ці фізічнай асобы (*абанента*) на часовае карыстанне чым-н. (напр., тэлефонам, месцам ў тэатры, кнігамі ў б-цы), а таксама дакумент, які забяспечвае гэта права.

**АБАНЕ́НТ** (ад франц. abonner падпісваць), асоба, установа ці арг-цыя, якая мае права на карыстанне *абанементам*.

**АБАНЕ́НЦКАЕ ТЭЛЕГРАФАВА́ННЕ**, тэлекс, электрычная сувязь паміж *абанентамі* шляхам непасрэднага двухбаковага абмену тэлегр. паведамленнямі. Ажыццяўляецца станцыямі А.т. ручной або аўтам. сістэмы. На найб. адказных участках сувязі выкарыстоўваюць каналы *частотнага тэлеграфавання*.

**АБАРА́НКІ**, хлебабулачныя вырабы з абваранага цеста ў выглядзе кольцаў рознай велічыні. Называлі і абваранкамі (ад абварыць). Упершыню пачалі рабіць А. ў Смаргоні (Беларусь), потым сталі вядомыя ў многіх (пераважна слав.) народаў. Славіліся янаўскія, бешанковіцкія, полацкія, мірскія і інш. А. Выкарыстоўваліся і для прыгатавання *кануна*.

**АБАРАЧА́ЛЬНАЯ СІСТЭ́МА**, частка аптычнай сістэмы для змены напрамкаў восяў сіметрыі *відарыса аптычнага*, створанага аб'ектывам, на процілеглы. Паводле канструкцыі А.с. падзяляюць на лінзавыя (складаюцца з лінзаў і апертурнай дыяфрагмы), прызмавыя (пабудаваны на выкарыстанні поўнага ўнутр. адбіцця святла), люстраныя (складаюцца з некалькіх люстэркаў) і валаконна-аптычныя. Выкарыстоўваюцца ў біноклях, перыскопах і інш. аптычных прыладах.

**АБАРАЧА́ЛЬНЫ ПРАЦЭ́С** у тэрмадынаміцы, працэс пераходу сістэмы з аднаго стану ў другі, які магчыма ажыццявіць у адваротным напрамку з паўтарэннем усіх яго прамежкавых станаў. Складаецца з паслядоўнасці станаў раўнавагі, якія вельмі мала розняцца паміж сабою, таму яго наз. квазістатычным, квазіраўнаважным. Крытэрыем абарачальнасці з'яўляюцца паводзіны *энтрапіі*: яна застаецца пастаяннай у А.п., які працякае ў ізаляванай сістэме значна павольней, чым устанаўліваецца тэрмадынамічная раўнавага ў дадзенай сістэме. Сістэма пры А.п. выконвае найб. магчымую работу. А.п. ляжыць у аснове тэорыі цеплавых рухавікоў (гл. *Карно цыкл*). Усе рэальныя працэсы з-за трэння, дыфузіі, выпрамянення і інш. неабарачальныя.

**АБАРАЧА́ЛЬНЫЯ РЭА́КЦЫІ**, хімічныя рэакцыі, якія адначасова адбываюцца ў прамым і адваротным напрамках і знаходзяцца ў стане дынамічнай раўнавагі. Кірунак рэакцый залежыць ад канцэнтрацыі рэчываў — удзельнікаў рэакцый. Пры дасягненні *раўнавагі хімічнай* скорасці А.р. аднолькавыя і сістэма ўтрымлівае зыходныя рэчывы і прадукты.

Простыя А.р. (напр., $N_2O_4 \rightleftarrows 2NO_2$) складаюцца з дзвюх элементарных рэакцый, якія адрозніваюцца толькі напрамкам ($N_2O_4 \rightarrow 2NO_2$ і $2NO_2 \rightarrow N_2O_4$). Складаныя бываюць абарачальныя пры ўмове абарачальнасці ўсіх стадый (напр., $N_2+3H_2 \rightleftarrows 2NH_3$). А.р. пры пэўных умовах ператвараюцца ў практычна *неабарачальныя рэакцыі*.

**АБАРАЧЭ́ННЕ**, інверсія ў музыцы, спосаб мадыфікацыі акордаў, інтэрвалаў, гукавышыннай лініі (мелодыі, матыву, серыі) перамяшчэннем гукаў у адваротным напрамку з захаваннем першапачатковай часавай паслядоўнасці. Сродак вар'іравання, у выніку якога ўзнікаюць новыя элементы, ствараецца роднасная, аднак фактычна новая мелодыя. Гук, які пры А. застаецца на месцы, наз. воссю А. Выкарыстоўвалася ў *канонах*, *жыгах*, *рычэркарах* і *фугах*, пазней ў неполіфанічных творах. *Т.Г.Мдывані.*

**АБАРАЧЭ́ННЕ** ў эканоміцы, форма таварнага абмену прадуктаў працы і інш. аб'ектаў уласнасці праз куплю-продаж. З'яўляецца бясконцым працэсам мноства самастойных актаў куплі і



Да арт. Абарачальная сістэма.

Абарог.

продажу, які звязвае вытв-сць з размеркаваннем і спажываннем. Ад *абмену* тавараў (Т—Т) адрозніваецца тым, што ажыццяўляецца пры пасрэдніцтве *грошай* (Т—Г—Т). Развіццё А. звязана з таварнай вытв-сцю.

На пач. этапах абмяжоўвалася мясц. рынкам. З паглыбленнем грамадскага падзелу працы і пашырэннем таварна-грашовых адносін сфарміраваліся ўнутр. і сусв. рынкі, пачалося развіццё крэдытнага А., А. каштоўных папер і інш. формаў.

**АБАРДА́Ж** (франц. abordage), спосаб вядзення бою вёславымі і парусными караблямі. Адзін або некалькі атакоўчых караблёў падыходзілі да карабля праціўніка як мага шчыльней, счаплялiся з ім бартамі, высаджвалі абардажную каманду, якая ў рукапашнай сутычцы вырашала зыход бою. Выкарыстоўваўся са стараж. часоў да 19 ст.; разам з таранным ударам складаў аснову тактыкі марскога бою. З развіццём карабельнай артылерыі, ростам агнявой магутнасці і быстраходнасці караблёў страціў сваё значэнне. Выкарыстоўваюць пры перадачы (прыёме) грузу і людзей.

**АБАРО́Г**, лёгкае збудаванне для захоўвання сена. Невялікая 4- ці 2-схільная рухомая стрэшка на 4 высокіх слупах, накрытая саломай або дранкай; пры патрэбе можа падымацца і апускацца. Здаўна вядома на Беларусі, паўн. Украіне, ПнЗ Расіі.

**АБАРО́НА**, баявыя дзеянні з мэтай зрыву або адбіцця *наступлення* намнога большых сіл праціўніка, прыкрыцця або ўтрымання занятых пазіцый, выйгрышу часу і стварэння ўмоў для пераходу у наступленне войскаў, якія абараняюцца. Ажыццяўляецца ў тактычных, аператыўных і стратэг. маштабах, прымусова (калі наступленне немагчыма або немэтазгодна) або наўмысна.

У старажытнасці і сярэднявеччы для доўгатэрміновай А. выкарыстоўвалі ўмацаваныя гарады, крэпасці, замкі (гл. *Абарончыя збудаванні*). З аснашчэннем арміі агнястрэльнай зброяй (з 14—15 ст.) пачалося збудаванне палявых абарончых умацаванняў. З распаўсюджваннем у 19 ст. наразной зброі з большай далёкасцю стральбы сталі ствараць глыбокую (эшаліраваную) А. Умацаваная паласа глыбінёй 1000—1500 м упершыню была створана ў час *Севастопальскай абароны 1854—55*. У 1-ю сусв. вайну ў прамежках паміж апорнымі пунктамі ствараліся суцэльныя лініі траншэй. Войскі займалі некалькі абарончых пазіцый, якія эшаліраваліся ў глыбіню на 3—4 км адна ад адной. За гэтымі пазіцыямі ствараліся тылавыя (запасныя) абарончыя палосы. Будавалася А. на суцэльным фронце з выкарыстаннем сістэмы інж. збудаванняў і загарод. З насычэннем ўзбр. сіл танкамі, дальнабойнай артылерыяй, самалётамі А. стала глыбокай, шматпалоснай, процітанкавай, проціартылерыйскай, процісамалётнай. Усебаковае развіццё А. атрымала ў Вял. Айч. вайну. На тэр. Беларусі цяжкія абаронныя баі ішлі ў чэрв.—жн. 1941 (гл. *Брэсцкай крэпасці абарона 1941*, *Мінска абарона 1941*, *Віцебска абарона 1941*, *Магілёва абарона 1941*, *Гомеля абарона 1941* і інш.).

У сучасных умовах А. прадугледжвае актыўнае процідзеянне адначасовым ударам усіх відаў зброі, авіяцыі і артылерыі, дэсантных і інш. войскаў праціўніка, своечасовае выяўленне яго сродкаў масавага паражэння, жывой сілы і тэхнікі, стварэнне найб. зручных умоў для сябе. Каб сарваць ці аслабіць наступленне, войскі ў А. ажыццяўляюць агнявую контрпадрыхтоўку па групоўцы праціўніка, якая падрыхтавалася да наступлення, і контратакуюць. Паводле метадаў вядзення А. бывае пазіцыйная і манеўраная; сучасная А., як правіла, спалучае абодва гэтыя метады. Устойлівасці і актыўнасці А. спрыяюць насычанасць яе браніраванымі сродкамі, глыбокае эшаліраванне і разгрупаванне сіл і сродкаў,

разнастайнасць спосабаў вядзення абарончых дзеянняў, выкарыстанне спецыфічных фіз.-геагр. умоў.

*Літ.:* Тактика. 2 изд. М., 1988. С. 320—407. *У.П.Рудэнка, В.А.Юшкевіч.*

**АБАРО́НА АЙЧЫ́НЫ**, абарона краіны ад знешняга нападу, пагрозы яе незалежнасці і тэр. цэласнасці. Абарона Рэспублікі Беларусь — найважнейшая функцыя дзяржавы, канстытуцыйны абавязак і доўг кожнага яе грамадзяніна. Актыўная форма рэалізацыі гэтага абавязку — *ваенная служба*. Закон «Аб усеагульным воінскім абавязку і ваеннай службе» ад 5.11.1992 рэгламентуе парадак падрыхтоўкі насельніцтва да абароны краіны і забеспячэння камплектавання яе *Узброеных Сіл*.

**АБАРО́НА ГО́НАРУ І ГО́ДНАСЦІ**, адна з формаў судовай аховы правоў фізічных і юрыд. асоб. Грамадзянін або юрыд. асоба маюць права патрабаваць праз суд абвяржэння недаказаных звестак, якія ганьбяць іх гонар, годнасць або дзелавую рэпутацыю. Ганебныя звесткі, распаўсюджаныя ў сродках масавай інфармацыі, абвяргаюцца там жа. Дакумент, які выходзіць ад юрыд. асобы і змяшчае ганебныя звесткі, падлягае адмене. Інш. выпадкі разглядаюцца судом. Маральная (немаёмасная) шкода кампенсуецца, памер яе вызначаецца судом.

**АБАРО́НА ГРАМАДЗЯ́НСКІХ ПРАВО́Ў**, у цывільным праве сукупнасць дзеянняў па ахове законных маёмасных і асабістых немаёмасных правоў грамадзян. Ажыццяўляецца ва ўстаноўленым судом парадку праз: прызнанне гэтых правоў; аднаўленне становішча, якое існавала да парушэння права і спынення дзеянняў, што парушаюць права; прысуджэнне да выканання абавязацельства ў натуры; спыненне або змену праваадносін; спагнанне з асобы, якая парушыла права, нанесеных страт, няўстойкі, а таксама інш. законныя спосабы. У выпадках, асобна прадугледжаных законам, можа ажыццяўляцца ў адм. парадку.

**АБАРО́НА ДЫПЛАМАТЫ́ЧНАЯ**, абарона дзяржавай сваіх грамадзян пры парушэнні іх правоў і інтарэсаў у замежнай дзяржаве. Ажыццяўляецца праз дыпламат. і консульскія прадстаўніцтвы за мяжой. Рэгулюецца міжнар. пагадненнямі, двухбаковымі консульскімі канвенцыямі і нац. заканадаўствам.



Да арт. **Абарончыя збудаванні**. Навагрудскі замак. Пачатак 16 ст. Рэканструкцыя.

Да арт. **Абарончыя збудаванні**. Лідскі замак. З малюнка Н.Орды. Сярэдзіна 19 ст.

Да арт. **Абарончыя збудаванні**. Бросцкая крэпасць. З карціны мастака М.Залескага. 1840.

Абарону і заступніцтва грамадзян Беларусі на яе тэр. і за межамі дзяржавы гарантуе Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь.

**АБАРО́НА СУДО́ВАЯ**, сукупнасць працэсуальных гарантаваных законам дзеянняў, накіраваных на ахову правоў і інтарэсаў грамадзян. У Рэспубліцы Беларусь ажыццяўляецца судом праз дакладна рэгламентаваны парадак разгляду спраў, бакам даюцца аднолькавыя магчымасці ў працэсе. Грамадзяне маюць права абскарджваць у судзе неправамерныя дзеянні органаў дзярж. кіравання і службовых асоб, у касацыйным парадку суд. пастановы, абараняць сваю маёмасць і асобу і інш.

**АБАРО́НЧЫЯ ЗБУДАВА́ННІ**, штучныя перашкоды, прызначаныя для доўгатэрміновай *абароны* нас. пункта ці пэўнай тэрыторыі ад праціўніка.

Найб. стараж. А.з. — агароджы з дрэва, зямлі ці камянёў, равы, валы. У Стараж. Рыме ствараліся ўмацаваныя ваен. пасяленні — лагеры. На ўскраінах Рым. імперыі будавалі т. зв. рымскія валы (*Адрыянаў вал*, *Антанінаў вал*, *Траянаў вал*). Разнастайныя тыпы А.з. ствараліся ў сярэднявеччы: для абароны замкаў, манастыроў (земляныя валы, равы, крапасныя драўляныя і мураваныя сцены, вежы з байніцамі і машыкулямі, брамы з герсамі, барбаканы), аховы вял. тэрыторый (*Вялікая Кітайская сцяна*, «Вялікая засечная мяжа» на паўд. межах Рас. дзяржавы ў 16—17 ст. і інш.). Своеасаблівыя тыпы А.з. — *дзядзінец*, *крэмль*, *замак*.

Першыя А.з. на тэр. Беларусі — *гарадзішчы*, з'явіліся ў жал. веку (7 ст. да н.э. — 4 ст. н.э.). Паступова яны ўскладняліся ад простых драўляных агароджаў па краях да шматрадных драўляна-земляных умацаванняў. З развіццём гарадоў (9—13 ст.) гал. А.з. сталі равы, драўляныя сцены і вежы (Полацк, Тураў, Віцебск, Мінск). У 12 ст. з'явіліся мураваныя вежы з выкарыстаннем у муроўцы валуноў (Гродна). З пераходам да тактыкі прамога штурму і аблогі ў 13 ст. сфарміравалася новая сістэма абароны горада, у аснове якой была вежа-данжон у драўляным ці мураваным замку (гл. *Навагрудскія замкі*, *Камянецкая вежа*, *Тураўская вежа* і інш.). У сярэдзіне 16 ст. з пашырэннем агнястрэльнай зброі ствараліся замкавыя комплексы (*Мірскі замак*, *Нясвіжскі замак*), узнікла *фартыфікацыя*, удасканальваліся традыц. драўляна-земляныя ўмацаванні. У Віцебску, Полацку, Магілёве, Слуцку, Брэсце, Рэчыцы і інш. існавала некалькі ліній абароны, якія ахоплівалі цэнтр горада і пасады. Абарончыя прыстасаванні мелі многія грамадзянскія збудаванні — ратушы, сядзібы, дамы-крэпасці, а таксама цэрквы, касцёлы, кляштары, манастыры, сінагогі. Іх сцены будаваліся высокія і тоўстыя, па кутах будынкаў ці над уваходам ставіліся баявыя вежы з байніцамі, уваходы дадаткова засцерагаліся бабінцамі, каванымі дзвярыма, пад'ёмнымі кратамі-герсамі. Вакол будынкаў узводзіліся валы з драўлянымі ці мураванымі сценамі, вежамі або

бастыёнамі. Адзін з першых умацаваных храмаў на Беларусі — *Полацкі Сафійскі сабор*. Аналагічнымі абарончымі храмамі былі *Супрасльская царква-крэпасць*, *Сынковіцкая царква-крэпасць*, *Мураванкаўская царква-крэпасць*, *Камайскі касцёл* і інш. У 19 ст. ўзніклі фортавыя А.з. (гл. *Крэпасць*) з вынесенымі на 1—2 км наперад ад цэнтр. ўмацавання фортамі (*Брэсцкая крэпасць*, *Бабруйская крэпасць*). У 1-й пал. 20 ст. ствараліся ўмацаваныя раёны і палосы абароны (напр., *Беларуская прыгранічная паласа абароны*).

*Літ.*: Ткачоў М.А. Замкі Беларусі (XIII—XVII ст.). Мн., 1977; Яго ж. Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII—XVIII стст. Мн., 1978. *М.А.Ткачоў.*

**АБАРО́Т КАПІТА́ЛУ**, працэс узнаўлення руху ўсяго *авансаванага капіталу*, які бясконца паўтараецца. Не супадае з *кругаабаротам капіталу*. Поўны А.к. адбываецца толькі тады, калі ў грашовай форме вяртаецца авансаваная вартасць *асноўнага капіталу* і ён аднаўляе сваю матэрыяльную форму. Таму А.к. ахоплівае некалькі кругаабаротаў капіталу. Час, на працягу якога авансаваны ў грашовай форме капітал вяртаецца ў той жа форме да прадпрымальніка, наз. часам А.к. Адзінкай вымярэння А.к. служыць год. Хуткасць А.к. вызначаецца па формуле: $n = \frac{A}{a}$, дзе n — колькасць абаротаў, А — адзінка вымярэння, а — час абароту індывід. капіталу. Хуткасць А.к. — паказчык жыццяздольнасці капіталу. На яе ўплываюць час вытв-сці і час абарачэння, а таксама суадносіны асн. і *абаротнага капіталу* ў авансаваным капітале.

**АБАРО́ТНАЕ ВОДАЗАБЕСПЯЧЭ́ННЕ**, сістэма водазабеспячэння на прадпрыемствах, пры якой адбываецца шматразовы абарот вады ў тэхнал. працэсе пры абмежаваным яе скідванні ў вадаёмы (да 3%) ці інш. водапрыёмнікі. Перад паўторным выкарыстаннем адпрацаваную ваду ачышчаюць, ахалоджваюць і апрацоўваюць залежна ад мэтаў вытв-сці ў адкрытых вадаёмах, *градзірнях*, басейнах пырскальных, ачышчальных установах. Выкарыстанне А.в. замест праматочнага змяншае расход вады, эксплуатац. выдаткі, забруджванне навакольнага асяроддзя.

**АБАРО́ТНЫ КАПІТА́Л**, частка пастаяннага *прадукцыйнага капіталу*, вартасць якога ў працэсе яго вытв. расходавання цалкам пераносіцца на прадукт і цалкам вяртаецца да прадпрымальніка ў грашовай форме ў канцы кожнага *кругаабароту капіталу*. Да А.к. адносіцца капітал, авансаваны на куплю сыравіны, паліва, дапаможных матэрыялаў і інш. прадметаў працы, а таксама *пераменны капітал*. А.к. абарачаецца хутчэй за *асноўны капітал*. Чым большая доля А.к. ў авансаваным капітале, тым меншы час абароту ўсяго капіталу і большы прыбытак.

**АБАРО́ТНЫЯ СРО́ДКІ**, грашовыя сродкі, прызначаныя на ўтварэнне абаротных вытв. фондаў і фондаў абарачэння. Адна іх частка дзейнічае ў вытв. сферы і набывае форму вытв. запасаў, *незавершанай вытворчасці* і наступных затрат, другая абслугоўвае сферу абарачэння і набывае форму гатовых вырабаў, грашовых сродкаў і сродкаў у разліках. Асн. крыніца фарміравання першых — даход (прыбытак), другіх — кароткатэрміновы крэдыт. Эфектыўнасць выкарыстання А.с. характарызуецца колькасцю абаротаў (каэфіцыентам абарачэння) і працягласцю аднаго абароту (хуткасцю абароту).

Колькасць абаротаў вызначаецца па формуле Ка = РП : А, дзе РП — аб'ём рэалізаванай прадукцыі за дадзены перыяд, А. — сярэднегадавая сума А.с. за гэты ж перыяд. Хуткасць абароту (у днях) вызначаецца па формуле: Ха = Д : Ка, дзе Д — колькасць дзён у перыядзе. Паскарэнне абарачальнасці А.с. — адна з важных умоў эканоміі сродкаў, павышэння эфектыўнасці вытв-сці.



Да арт. **Абарончыя збудаванні**. Замак Крак-дэ-Шэвалье ў Сірыі. 12—пач. 13 ст.

Да арт. **Абарончыя збудаванні**. Крэпасць у Каркасоне (Францыя). 13 ст.

**АБАРО́ТНЫЯ ФО́НДЫ**, частка *вытворчых фондаў* прадпрыемства, якая цалкам расходуецца ў вытв. цыкле і цалкам пераносіць сваю вартасць на новы прадукт. Матэрыяльна-рэчыўную аснову А.ф. складаюць прадметы працы (матэрыялы, сыравіна і інш.), што знаходзяцца на складах у выглядзе *вытворчых запасаў* і незавершанай вытв-сці. У рыначнай эканоміцы А.ф. — пастаянная частка *абаротнага капіталу*.

**АБАРЫГЕ́НЫ** (лац. Aborigines ад ab origine ад пачатку), 1) карэнныя насельнікі (людзі, жывёлы, расліны) краіны ці якой-н. мясцовасці. Паводле стараж.-рым. паданняў, А. наз. племя, якое жыло каля падножжа Апенін. 2) У біялогіі тое, што *аўтахтоны*.

**АБА́С** Хаджа Ахмад (7.6.1914, г. Паніпат, Індыя — 1987), індыйскі кінарэжысёр, сцэнарыст, пісьменнік. Скончыў Алігархскі мусульманскі ун-т. Удзельнік стварэння Асацыяцыі нар. т-раў Індыі (1943). Пастаноўшчык маст. фільмаў «Незвычайнае здарэнне», «Іншаземец» (з рэж. В.Пронiным, у сав. пракаце «Хаджэнне за тры моры»), «Дзве кроплі вады» і інш. Аўтар сцэнарыяў фільмаў «Бессмяротная гісторыя доктара Котніса», «Бадзяга», «Пан 420» (абодва ў сааўт.), сац. раманаў «Заўтра належыць нам» (1945), «Крывавы шлях» (1980) і інш.

**АБА́С I** Вялікі (27.1.1557—19.1.1629), шах Ірана [1587—1629] з дынастыі *Сефевідаў*. Дзеля ўмацавання цэнтр. улады рэфармаваў войска, фін. сістэму, адм. кіраванне і інш. Спрыяў развіццю знешняга і ўнутр. гандлю. Перанёс сталіцу з Казвіна ў Ісфахан (1597—98). Вёў шматлікія войны, вярнуў страчаныя раней і заваяваў новыя тэрыторыі, спыніў набегі узбекаў. Наладзіў дыпламат. і гандл. кантакты з краінамі Зах. Еўропы. Пры ім сефевідскі Іран дасягнуў найб. магутнасці.

Абас I.

**АБА́САЎ** Азад Зінатавіч (н. 19.1.1925, г. Елабута), татарскі спявак (тэнар). Нар. арт. СССР (1977). Скончыў Маскоўскую кансерваторыю (1950). З 1950 саліст Тат. т-ра оперы і балета. Сярод партый: Фауст («Фауст» Ш.Гуно), Герцаг («Рыгалета» Дж.Вердзі), Самазванец («Барыс Гадуноў» М.Мусаргскага), Уладзімір Ігаравіч («Князь Ігар» А.Барадзіна), Джык, Джаліль, Цюляк («Алтынчэч», «Джаліль», «Цюляк» Н.Жыганава).

**АБА́САЎ** Шухрат Саліхавіч (н. 16.1.1931, г. Каканд), узбекскі кінарэжысёр, сцэнарыст. Нар. арт. Узбекістана (1975), нар. арт. СССР (1981). Скончыў Ташкенцкі тэатр.-маст. ін-т (1954), Вышэйшыя рэж. курсы пры «Масфільме» (1958). Творчасці А. ўласціва ўменне раскрываць час і эпоху праз асобу героя. Найб. поўна гэта выявілася ў фільмах «Ты не сірата», «Абу Райхан Беруні» (за абодва Дзярж. прэмія Узбекістана імя Хамзы 1974), «Ташкент — горад хлебны», «Вогненная дарогі» (16 серый, тэлевізійны). Сааўтар большасці сцэнарыяў сваіх фільмаў.

**АБАСІ́ДАЎ ХАЛІФА́Т**, Багдадскі халіфат, дзяржава арабаў у 750—1258. Назва ад дынастыі *Абасідаў*, якія прыйшлі да ўлады ў выніку справакаванага імі ў 747 у Харасане паўстання супраць *Амеядаў*. Сталіца з 762 Багдад. У склад А.х. ўваходзілі Ірак, Іран (да пач. 9 ст.), ч. Закаўказзя, паўд. ч. Сярэдняй Азіі, Зах. Аравія, Сірыя з Палесцінай, Егіпет і Паўн. Афрыка (да пач. 9 ст.). У А.х. іншаплямённыя мусульмане былі ўраўнаваны ў правах з арабамі, роды перс. паходжання вылучыліся на адно з першых месцаў. Абасіды аднавілі перс. адм. сістэму на чале з візірам, замянілі араб. апалчэнне прафес. наёмнай арміяй (з харасанцаў, берберaў, пазней цюркаў). Гал. месца ў войску заняла гвардыя халіфа (з нявольнікаў), якая, памацнеўшы, стала ўмешвацца ва ўладу. У А.х. найб. ўздыму дасягнула арабамусульм. духоўная (іслам, ісламскае права, л-ра, філасофія, навука) і матэрыяльная (рамёствы, гандаль, мараплаванне і інш.) культура. Частыя нар. паўстанні (гал. чынам у форме сектанцкіх рухаў), з 9 ст. і сепаратызм намеснікаў-эміраў, якія сілай захоплівалі тэрыторыі і ператварaлі іх у самаст. дзяржавы (напр., Ідрысідаў у Марока, *Аглабідаў* у Іфрыкіі і інш.), вялі да распаду А.х. На пач. 10 ст. ў ім засталіся зах. ч. Ірана і тэрыторыя, сумежная з Багдадам. Канчаткова А.х. знішчыла манг. нашэсце.

*Літ.*: Беляев Е.А. Арабы, ислам и арабский халифат в раннем средневековье. 2 изд. М., 1966; Васильев Л.С. История Востока. М., 1993. Т. 1, ч. 2. С. 272—281.

**АБАСІ́ДЫ**, дынастыя арабскіх халіфаў, якая правіла ў Багдадзе ў 750—1258 (гл. *Абасідаў халіфат*). Паходзіць ад Абаса, дзядзькі *Мухамеда*. Заснавальнік дынастыі Абу-ль-Абас ас-Сафах [750—754], які скінуў *Амеядаў*. Найб. буйныя прадстаўнікі — *Мансур* [754—775], *Харун ар-Рашыд* [786—809], Мамун [813—833]. Пасля захопу Буідамі ў 945 Багдада А. пазбаўлены свецкай улады. Апошні з А. аль-Мустасім [1242—58] у час нашэсця манголаў пакараны смерцю.

**А́БАСКІ МІ́РНЫ ТРАКТА́Т 1743**. Падпісаны паміж Расіяй і Швецыяй у г. Аба (сучасны Турку, Фінляндыя). Завяршыў рус.-швед. вайну 1741—43, якая скончылася паражэннем Швецыі. Пацвердзіў умовы *Ніштацкага мірнага дагавора 1721*. Устанавіў рус.-швед. мяжу па р. Кюмене (цяпер Кюмі-Іокі, Фінляндыя).

**АБАСТУМА́НІ**, горнакліматычны курорт у Грузіі. За 28 км ад чыг. ст. Ахалцыхе, на схілах Месхецкага хр. Малога Каўказа і глыбокай цясніны р. Ацхе. Засн. ў 19 ст. Круглагадовае кліматалячэнне, значныя запасы тэрмальных мінер. водаў (асобныя крыніцы вядомы з 11 ст.).

Паблізу А. першая на тэр. б. СССР горная астрафіз. абсерваторыя, крэпасць царыцы Тамары (12 ст.), Зарзмскі манастыр (14 ст.), у суседстве з ім рэшткі грандыёзнага пячорнага манастыра 12—13 ст.

**АБАСЫ́**, абаасы, у якуцкай міфалогіі злыя духі; маюць аблічча чалавека ростам з лістоўніцу або адноногай, аднарукай, аднавокай пачвары. Усё шкоднае і агіднае створана А. Яны спакушаюць і падбухторваюць людзей на злачынствы, насылаюць на іх бедствы і хваробы.

**АБА́Т** [лац. abbas (abbatis) ад грэч. abba бацька], настаяцель каталіцкага манастыра — *абацтва* (настаяцельніца — абатыса). Першапачаткова паводле статута выбіраўся манахамі і зацвярджаўся *епіскапам*, фактычна назначаўся свецкімі магнатамі. У больш агульным значэнні — свяшчэннаслужыцель у каталіцкай царкве.

**АБА́ЦТВА**, вялікі каталіцкі манастыр з маёмасцю і зямельнымі ўладаннямі, якім кіруе *абат* ці абатыса. Падпарадкоўваецца епіскапу, часам непасрэдна рымскаму папу. Паявіліся А. ў 5—6 ст., уплывалі на рэліг., эканам. і паліт. жыццё Зах. Еўропы. У перыяд Рэфармацыі і асабліва ў ходзе бурж. рэвалюцый 18 ст. страцілі сваё значэнне. Часткова захаваліся ў Іспаніі, Францыі, Італіі і інш.

**АБА́ШАЎСКАЯ КУЛЬТУ́РА**, археалагічная культура плямён бронзавага веку, якія ў 2—3-й чвэрці 2-га тыс. да н.э. насялялі лясныя і лесастэпавыя вобласці Сярэдняга Паволжа, Падоння і Паўд. Урал. Назва ад могільніка каля в. Абашава (Чувашыя). Насельніцтва займалася пераважна жывёлагадоўляй, жыло на адкрытых і ўмацаваных паселішчах у вялікіх (даўж. да 30—40 м) дамах. Пахавальны абрад — падкурганнае трупапалажэнне ў скурчаным ці выцягнутым (на спіне) становішчы. Характэрны керамічны посуд звона- і слоікападобнай формы з геам. арнаментам і дамешкамі ў гліне ракавінак. Плямёны А.к. першыя пачалі распрацоўку ўральскіх радовішчаў медзі, з імі звязваюць з'яўленне ў стэпах Еўразіі *каляснiц*. Шмат даследчыкаў лічаць А.к. культ.-гіст. агульнасцю і вылучаюць у ёй шэраг археал. культур.

**АБАШЫ́ДЗЕ** Васіль (Васо) Аляксеевіч (4.12.1854, г. Душэты — 9.10.1926), грузінскі акцёр, рэжысёр. Нар. арт. Рэспублікі (1922). З 1879 у Тыфліскай драм. трупе. Адзін з заснавальнікаў рэаліст. груз. акцёрскай школы. Стварыў яркія характарныя і камед. вобразы ў нац. і класічным рэпертуары: Карапет («Скупы» Г.Эрыставі), Акоп («Ханума» А.Цагарэлі), Хлестакоў, Гараднічы («Рэвізор» М.Гогаля), Шмага («Без віны вінаватыя» А.Астроўскага) і інш. Заснавальнік і рэдактар першага ў Грузіі тэатр. час. «Тэатры» (з 1885).

**АБАШЫ́ДЗЕ** Грыгол Рыгоравіч (1.8.1914, г. Чыятура, Грузія — 29.7.1994), грузінскі пісьменнік. Акад. АН Грузіі (1979). Герой Сац. Працы (1974). Скончыў Тбіліскі ун-т (1936). Распрацоўваў гіст. і актуальныя тэмы сучаснасці: паэмы «Георгій Шосты» (1942), «Непераможны Каўказ» (1943), «Легенда пра першых тбілісцаў» (1959), цыкл вершаў «Продкі і сучаснікі. Літаратурныя пісьмы» (1979), зб. вершаў «Залаты вінаградник» (1966) і інш. Раманы (трылогія) «Лашарэла» (1957), «Доўгая ноч» (1963), «Цотнэ, або Падзенне і ўзвышэнне Грузіі» (1975) прысвечаны Грузіі 11—13 ст. Дзярж. прэмія СССР 1951.

**АБАШЫ́ДЗЕ** Іраклій Вісарыёнавіч (23.11.1909, г. Хоні, Грузія — 13.1. 1992), грузінскі паэт. Акад. АН Грузіі (1960). Герой Сац. Працы (1979). Скончыў Тбіліскі ун-т (1931). У 1966—92 гал. рэдактар Груз. Энцыклапедыі. Асн. тэмы творчасці — Грузія ў мінулым і сучасным, лёс мастацтва, грамадзянскі абавязак паэта. Аўтар зб-каў паэзіі «Набліжэнне» (1966), «І гэтыя песні — маёй Грузіі» (1971), «Радзіма» (1973), «Вятры ў даліне Рыёні» (1979), цыклаў вершаў «Па слядах Руставелі» (1959), «Палесціна, Палесціна» (прэмія імя Ш.Руставелі 1966), літ.-крыт. артыкулаў (зб. «За высокае майстэрства», 1959). За цыкл «У палымянай Індыі» і кн. «Па дарогах Індыі» Міжнар. прэмія імя Дж.Нэру 1972.

**АБВАДНЕ́ННЕ**, сукупнасць гідратэхнічных мерапрыемстваў па забеспячэнні вадой бязводных і малаводных раёнаў. Ажыццяўляецца праз асваенне мясц. рэсурсаў вады, перакідкай яе па каналах і трубаправодах, буд-вам рэзервовых вадаёмаў і інш. А. развіта ў Сярэдняй Азіі, ЗША, Аўстраліі, Новай Зеландыі і інш. На тэр. Беларусі А. выкарыстоўваюць на дажджаванне сельгасугоддзяў, патрэбы прамысл. і камунальнай гаспадаркі, супрацьпажарныя мэты. Комплексна выкарыстоўваюць вадасховішчы Заслаўскае, Любанскае, Салігорскае і інш.

**АБВА́Л**, раптоўны адрыў і падзенне вял. масаў горных парод са стромкіх схілаў гор, рачных далін, абразійных марскіх берагоў. Здараюцца ад страты счаплення ці часовай апоры горных парод у выніку іх выветрывання, падмывання ці размыву, сейсмічных штуршкоў. Абрынутыя масы акумулююцца як завал. У выніку буйнейшага Усойскага А. на р. Мургаб (аб'ём пароды 2,2 млрд. м$^3$) утварылася Сарэзскае возера на Памірах (1911).

**АБВАЛАВА́ННЕ**, сістэма загараджальных земляных валоў і дамбаў уздоўж берагоў рэк, вадасховішчаў, марскіх узбярэжжаў і інш. Ахоўвае тэр. ад затаплення ў час разводдзя, паводкі, ветравых нагонаў вады, прыліваў. Робяць і для забеспячэння ўстойлівага земляробства на поймавых землях, пры буд-ве *польдэраў*. На Бел. Палессі маштабныя работы па А. праведзены ў пойме Прыпяці.

**А́БВЕР** (ням. Abwehr), орган ваен. разведкі і контрразведкі Германіі ў 1919—44. У 1935—44 А. узначальваў адм. Ф.В.Канарыс. У 1944 у складзе Гал. ўпраўлення імперскай бяспекі, падпарадкаванага Г.Гімлеру. У Вял. Айч. вайну на акупіраванай тэр. Беларусі дзейнічалі 4 развед., 3 дыверсійна-тэрарыст. і 9 контрразвед. груп А., спец. аператыўная група «Мінск», а таксама асобныя падраздзяленні развед. і контрразвед. органаў А. «Зондэрштаб-Р», «Інгвар», «Цэпелін».

**АБВІНАВА́ЎЧАЕ ЗАКЛЮЧЭ́ННЕ**, працэсуальны дакумент, у якім выкладзена і абгрунтавана рашэнне следчага (або асобы, якая праводзіла дазнанне) аб фармулёўцы абвінавачання асобы, прыцягнутай да крымін. адказнасці. У ім падсумоўваюцца вынікі папярэдняга следства па справе, робіцца вывад пра ўчыненне злачынства пэўнай асобай, пра дастатковасць падстаў для суд. разгляду справы. Складаецца з апісальнай і рэзалютыўнай частак. У апісальнай частцы выкладаецца сутнасць справы, у рэзалютыўнай зменшчаюцца звесткі пра *абвінавачанага* (абвінавачаных) і фармулёўка прад'яўленага абвінавачання са спасылкай на адпаведныя артыкулы Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь. Следчы падпісвае А.з. і разам са справай перадае пракурору, які зацвярджае А.з. і накіроўвае справу ў суд ці вяртае яе для дадатковага следства або спыняе справу. А.з. ўручаецца абвінавачанаму не пазней як за 3 сут да суд. разгляду, што дае яму магчымасць азнаёміцца з доказамі і падрыхтавацца да абароны. *І.І.Пацяружа.*

Да арт. **Абвадненне.** Вадавод з р. Амудар'я ў стэп.



**Абвалаванне** зямель для аховы ад паводак: *1* — дамба, што затапляецца; *2* — дамба, што не затапляецца; УВП — узровень веснавой паводкі; УЛ-АП — узровень летне-асенняй паводкі; УМВ — узровень межанных водаў.

**АБВІНАВА́ЧАННЕ** ў праве, 1) працэсуальная дзейнасць упаўнаважаных законам органаў ці службовых асоб, якая заключаецца ў даказванні віны асобы, што прыцягваецца да крымін. адказнасці. Заканадаўства Рэспублікі Беларусь прадугледжвае 3 віды А.: дзярж. (падтрымлівае пракурор), грамадскае (падтрымлівае ўпаўнаважаны прадстаўнік грамадскай арг-цыі ці прац. калектыву) і прыватнае (падтрымлівае пацярпелы або яго прадстаўнік — адвакат). 2) Змест абвінаваўчага тэзіса, сфармуляванага ў пастанове аб прыцягненні ў якасці *абвінавачанага*, а таксама ў *абвінаваўчым заключэнні*, выступленні абвінаваўцы ў судзе, у абвінаваўчым прыгаворы суда. *І.І.Пацяружа.*

**АБВІНАВА́ЧАНЫ**, асоба, прыцягнутая да крымін. адказнасці ва ўстаноўленым законам парадку. Умовай прыцягнення асобы ў якасці А. з'яўляецца наяўнасць дастатковых доказаў пра ўчыненне ёю злачынства. Прававое становішча А. (працэсуальныя гарантыі, права на абарону і інш.) вызначаецца законам. А., аддадзены пад суд, наз. *падсудным.*

**АБВО́ЙНІК** (Periploca), род кустоў сям. ластаўневых. Вядома каля 15 відаў, пашыраны ў Міжземнамор'і, трапічнай

Абвойнік грэчаскі.

Афрыцы, ва ўмераных і субтрапічных паясах Азіі; на Каўказе расце А. грэчаскі (P. graeca), на Д.Усходзе А. тынавы (P. sepium).

Ліяны выш. да 12 м. Кветкі буйныя, да 3 см у дыяметры, зеленавата-бурыя, з цяжкім пахам. Плады — лістоўкі са шматлікім плоскім насеннем. Вырошчваюць як лек. і дэкар. расліны.

**АБВЯШЧЭ́ННЕ ВАЙНЫ́**, папярэдняе матываванае паведамленне адной дзяржавы аб ваен. дзеяннях супраць другой дзяржавы. Рэгулюецца 3-й Гаагскай канвенцыяй 1907, паводле якой вайна не павінна пачынацца без папярэджання, неабходнага для мірных перагавораў канфліктуючых дзяржаў і інфармавання нейтральных дзяржаў. А.в. з'яўляецца кампетэнцыяй вышэйшых органаў улады. У адпаведнасці з Канстытуцыяй

Рэспублікі Беларусь гэта права належыць Вярх. Савету. Існуючае міжнар. права, зыходзячы з прынцыпу неўжывання сілы і пагрозы сілай, кваліфікуе любы ваен. напад як агрэсію, міжнар. злачынства. Выкарыстанне ўзбр. сіл дапускаецца толькі як мера ў адказ супраць агрэсара. *Л.В.Паўлава.*

**АБВЯШЧЭ́ННЕ ПАМЕ́РЛЫМ**, паводле бел. права прызнанне па рашэнні суда грамадзяніна памерлым пры адсутнасці ў месцы яго пастаяннага жыхарства звестак пра яго месцазнаходжанне на працягу 3 гадоў, а калі ёсць падставы меркаваць, што ён прапаў без вестак пры абставінах, калі яму пагражала смерць, — на працягу 6 месяцаў. У выпадку яўкі або выяўлення месцазнаходжання такога грамадзяніна рашэнне аб А.п. адмяняецца судом.

**АБДАЛА́Х ІБН АЛЬ-САІ́Д МУХА́МЕД** Халіфа (1846 — ліст. 1899), правіцель незалежнай суданскай дзяржавы [1885—вер. 1898] пасля смерці *Махдзі*. Ліквідаваў сепаратызм правадыроў плямёнаў, умацаваў дзяржаву махдзістаў, стварыў моцную армію. Узначаліў супраціўленне суданцаў англ. каланізатарам у 1896—98. Пасля перамогі англічан пры Амдурмане (вер. 1898) кіраўнік партыз. барацьбы. Забіты ў баі.

**АБД АЛЬ-КА́ДЗІР**, Абд аль-Кадзер (Насір-ад-дзін ібн Мухіддзін аль-Хасані; 6.9.1808—26.5.1883), нацыянальны герой Алжыра, палкаводзец, вучоны, аратар, паэт. Паходзіў з уплывовага феад. роду. У 1832—47 узначаліў паўстанне супраць франц. акупацыі Алжыра. У 1832 абвешчаны султанам Зах. Алжыра, прыняў тытул эміра. У 1847—52 зняволены ў Францыі. З 1855 займаўся багаслоўем у Дамаску. Аўтар прац па вайск. справе, рэліг.-філас. трактата.

**АБД АЛЬ-КЕРЫ́М** (1881 або 1882 — 7.2.1963), паліт. і дзярж. дзеяч Марока. Атрымаў багаслоўскую адукацыю. За заклікі да вызв. барацьбы ў 1915 зняволены. У 1921 узначаліў вызв. барацьбу рыфскіх плямёнаў супраць ісп., з 1925 франц. каланізатараў. Прэзідэнт (эмір) [1921—26] *Рыфскай рэспублікі*. У 1926 захоплены французамі і сасланы на в-аў Рэюньён. У 1947 атрымаў дазвол на выезд у Францыю пры ўмове, што не будзе займацца паліт. дзейнасцю. Уцёк і пасяліўся ў Каіры, дзе ўзначаліў (1948—56) Камітэт вызвалення Арабскага Магрыба.

**АБДАРАХМА́Н I** (каля 734—788), заснавальнік *Кардоўскага эмірата* ў Іспаніі і дынастыі *Амеядаў*. З-за ганенняў *Абасідаў* у 750 уцёк з Сірыі ў Іспанію, дзе ў 756 стварыў незалежны эмірат са сталіцай у Кордаве. Праводзіў палітыку цэнтралізацыі, паспяхова змагаўся з араба-берберскай плем. знаццю. Адбіў нападзенні хрысц. правіцеляў Паўн. Іспаніі і франкаў Карла Вялікага.

**АБДАРАХМА́Н II** (792—852), эмір *Кардоўскага эмірата* [822—852]. Праўнук *Абдарахмана I*. Спрыяў развіццю навук і мастацтва, выдаткоўваў вял. сродкі на буд-ва палацаў і мячэцяў, што прывяло да ўзмацнення падатковага прыгнёту. Вызначаўся верацярпімасцю. Устанавіў дыпламат. і гандл. адносіны з Візантыяй.

**АБДАРАХМА́Н III** ан-Насір (Перамаганосны; 7.1.891—961), эмір (з 912), халіф (з 929) *Кардоўскага эмірата*. У выніку 30-гадовай барацьбы з мясц. феадаламі і плямёнамі аднавіў адзінства эмірата, які распаўся пры яго папярэдніках. Падначаліў Сеуту (Марока), Таледа (Іспанія); яму плацілі даніну Леон і Навара. Устанавіў дыпламат. адносіны з Візантыяй і Атонам I у Германіі. Стварыў мацнейшы на Міжземным моры флот. Сфарміраваў гвардыю з еўрап. (пераважна славянскіх) рабоў. Спрыяў развіццю навук і мастацтва. Яго праўленне — вяршыня магутнасці кардоўскіх *Амеядаў*.

**АБДРАШЫ́ТАЎ** Вадзім Юсупавіч (н. 19.1.1945, г. Алматы), расійскі кінарэжысёр. Нар. арт. Расіі (1992). Скончыў Усесаюзны дзярж. ін-т кінематаграфіі (1974). Фільмам А. ўласцівы фабульная пэўнасць, стрыманасць і камерныя інтанацыі, кантрастныя паралелі: «Слова для абароны», «Спыніўся поезд» (Дзярж. прэмія Расіі 1984), «Парад планет», «Слуга» (Дзярж. прэмія СССР 1991) і інш.

**АБДУ́КЦЫЯ**, перанос акіянічнай кары і мантыі на ўскраіну кантынента. У выніку А. цяжкія блокі акіянскай літасферы нагрувашчваюцца на менш шчыльную кантынентальную кару, утвараючы афіялітавыя комплексы (гл. *Афіяліты*). Пашыраны ў знешніх частках складкавых абласцей Апалачаў, Альпаў, Гімалаеў, Андаў і інш.

**АБДУЛА́ САБІ́Р** (сапр. Абдулаеў Сабірджан; 18.9.1905, г. Каканд, Узбекістан — 1972), узбекскі паэт, драматург. Нар. паэт Узбекістана (1965). Засл. дзеяч мастацтваў Узбекістана (1944). Аўтар зб-каў паэзіі «Вясна» (1931), «Дружба» (1937), «Песні жыцця» (1962), гісторыка-біягр. рамана «Маўлона Мукімі» (1965), драм на тэмы сучаснасці, муз. драм на сюжэты нар. паданняў («Тахір і Зухра», 1943, «Алпамыш», 1958, і інш.).

**АБДУЛА́ЕЎ** Абдулхак Аксакалавіч (н. 30.12.1918, г. Туркестан Чымкенцкай вобл., Казахстан), узбекскі жывапісец. Нар. мастак Узбекістана (1968). Вучыўся ў Самаркандскім маст. тэхнікуме (1931—36), Маскоўскім маст. ін-це (1938—41). Аўтар нац. па каларыце партрэтаў паэта і мысліцеля А.Наваі, пісьменнікаў Айбека, І.Рахіма, К.Яшэна, «Аўтапартрэта ў кіргізскай шапцы» і інш.

**АБДУЛА́ЕЎ** Мікаіл Гусейн аглы (н. 19.12.1921, Баку), азербайджанскі жывапісец і графік. Нар. мастак СССР (1963). Чл.-кар. АМ СССР (1958). Скончыў Маскоўскі маст. ін-т імя Сурыкава (1949), вучыўся ў С.В.*Герасімава* і У.А.*Фаворскага*. У творчасці пераважаюць лірычныя тэмы: «Вечар», «Агні Мінгечаура», «Стогадовы рэчнік А.Бабаеў», «Індыйская серыя», серыі малюнкаў «За ракой Аракс»; іл. да паэмы М.Фізулі «Лейлі і Меджнун». Аўтар мазаічнага пано «Нізамі» ў Бакінскім метрапалітэне.

**АБДУ́ЛАЎ** Восіп Навумавіч (16.11.1900—14.6.1953), рус. акцёр. Нар. арт. Расіі (1944). Сцэн. дзейнасць пачаў у 1918. З 1943 у Маскоўскім т-ры імя Массавета. Яркі характарны акцёр. Яго мастацтву ўласцівы віртуозная тэхніка, камедыйнасць і тонкі гумар. Сярод лепшых роляў: Лыняеў («Ваўкі і авечкі» А.Астроўскага), Дзядзька Васа («Пані міністэрша» Б.Нушыча) і інш. Здымаўся ў кіно: Джон Сільвер («Вострай скарбаў»), Грэк Дымба («Вяселле» паводле А.Чэхава). Дзярж. прэмія СССР 1951.

**АБДУЛА́-ХАН II** Ібн Іскандэр (каля 1534—1598), узбекскі хан [1583—98] з дынастыі *Шайбанідаў*, пры якім дзяржава дасягнула найб. магутнасці. У 1557 захапіў Бухару і зрабіў яе сталіцай *Шайбанідаў дзяржавы*, далучыў Ташкент, тэр. на Пн ад Сырдар'і, Балх, Фергану, Харэзм і інш. Правёў заканад. і адм. рэформы, падтрымліваў развіццё рамёстваў і гандлю, архітэктуры і л-ры.

**АБДУ́Л-ХАМІ́Д II** (21.9.1842—10.2.1918), турэцкі султан [1876—1909]. Пад націскам *Мідхата-пашы* ў 1876 увёў канстытуцыю, аднак неўзабаве распусціў парламент і ўстанавіў дэспатычны рэжым. Інспіраваў армянскія пагромы, разню грэкаў на Крыце і інш., за што атрымаў мянушку Крывавы султан. Пасля *Младатурэцкай рэвалюцыі 1908* быў вымушаны аднавіць канстытуцыю 1876. 27.4.1909 арыштаваны *младатуркамі* за ўдзел у контррэв. перавароце. Памёр у стамбульскай турме.

**АБДУРАХМА́НАВА** Дзільбар Гулямаўна (н. 1.5.1936, Масква), узбекскі дырыжор. Нар. артыстка СССР (1977). Скончыла Ташкенцкую кансерваторыю (1960). Дырыжор, з 1976 маст. кіраўнік і гал. дырыжор Узб. т-ра оперы і балета. Пад яе кіраўніцтвам паст. оперныя («Пікавая дама» П.Чайкоўскага, «Атэла» Дж.Вердзі, «Вогненны анёл» С.Пракоф'ева, «Пётр Першы» А.Пятрова) і балетныя («Лебядзінае возера» Чайкоўскага, «Жызэль» А.Адана, «Спартак» А.Хачатурана, «Ганна Карэніна» Р.Шчадрына) спектаклі. Дзярж. прэмія Узбекістана 1973.

**АБДУРАХМА́НАЎ** Фуад Гасан аглы (11.5.1915, г. Шэкі, Азербайджан —

15.6.1971), азербайджанскі скульптар. Нар. мастак Азербайджана (1955). Чл.-кар. АМ СССР (1949). Вучыўся ў АМ у Ленінградзе (1935—40). Працаваў пераважна як манументаліст: помнікі Нізамі ў Гянджы (Дзярж. прэмія СССР 1947) і Баку, пісьменніку С.Вургуну ў Баку, паэту Рудакі ў Душанбе і інш.; статуя «Чабан» (Дзярж. прэмія СССР 1951). Творы А. адметныя выразнасцю формы, спакойнай, ураўнаважанай кампазіцыяй.

**АБДЭРГА́ЛЬДЭН** (Abderhalden) Эміль (9.3.1877 — 5.8.1950), швейцарскі біяхімік. Замежны чл.-кар. АН СССР (1925). У 1904—45 працаваў у Германіі; з 1946 у Цюрыхскім ун-це. Сінтэзаваў (разам з Э.Г.Фішэрам) поліпептыд з 19 амінакіслот (1916). Даследаваў структуру і функцыі бялкоў, ролю тлушчаў, вітамінаў, гармонаў пры харчаванні; адкрыў т. зв. ахоўныя ферменты, якія ўтвараюцца ў арганізме пры цяжарнасці, пухлінах і інш. Аўтар «Падручніка фізіялагічнай хіміі» (рус. пер. 1934).

**АБЕГЯ́Н** Манук Хачатуравіч (29.3.1865, с. Астапат каля Нахічэвані — 25.9.1944), армянскі літаратуразнавец, фальклярыст, лінгвіст. Акад. АН Арменіі (1943). Скончыў Іенскі ун-т (1898) са званнем д-ра філасофіі. Аўтар «Гісторыі старажытнаармянскай літаратуры» (т. 1—2, 1944—46), прац па арм. фальклоры, мове, вершаскладанні і лексікаграфіі. Апублікаваў варыянт эпасу «Давід Сасунскі» (1889), даследаванні па арм. міфалогіі і нар. эпасе.

**АБЕГЯ́Н** Мгер Манукавіч (н. 26.1.1909, г. Эчміядзін, Арменія), армянскі жывапісец і графік. Нар. мастак Арменіі (1960). Вучыўся ў Вышэйшым дзярж. маст.-тэхн. ін-це (Масква; 1927—30), АМ у Ленінградзе (1930—31). Аўтар маляўнічых пейзажаў, сакавітых нацюрмортаў, партрэтаў, пейзажна-жанравых карцін («На востраве Севан», «Калыханка», «Лета»), графічных пейзажаў (малюнкі, акварэлі, афорты, лінагравюры), прасякнутых лірычным настроем.

**АБЕ́ДАЎКА**, Дранёўка, меліярацыйны канал на Беларусі ў Калінкавіцкім р-не Гомельскай вобл., левы прыток канала Ненач (бас. Прыпяці). Даўж. 30 км. Пл. вадазбору 130 км$^2$.

**АБ'Е́ДКАЎ** Георгій Антонавіч (н. 19.2.1930, с. Кастрычніцкае Арэнбургскай вобл.), бел. вучоны ў галіне ветэрынарыі. Д-р вет. н. (1990). Скончыў Чкалаўскі с.-г. ін-т (1953). З 1957 у бел. НДІ эксперым. ветэрынарыі імя Вышалескага. Працы па патагенезе, імунагенезе, дыягностыцы і прафілактыцы бруцэлёзу жывёл, па туберкулёзе жывёл і імунагенезе гэтай хваробы на клетачным узроўні.

**АБЕЗВУГЛЯРО́ДЖВАННЕ**, памяншэнне колькасці вугляроду ў паверхневых слаях сталяў і сплаваў пры награванні ў асяроддзі кісларoду ці вадароду. Пагаршае ўласцівасці матэрыялаў. Дрэнны ўплыў А. змяншаюць награваннем матэрыялаў у ахоўным асяроддзі ці ў вакууме, скарачэннем часу ўздзеяння т-ры і інш. Абезвугляроджаны слой здымаюць мех. спосабам ці *адпалам* у аднаўляльных газавых сумесях. А. карыстаюцца для паляпшэння ўласцівасцяў металаў і сплаваў, у якіх вугляpод — непажаданы дамешак (напр., апрацоўка трансфарматарнай нержавейнай сталі ў спец. газавым асяроддзі).

**АБЕЗЗАРА́ЖВАННЕ**, тое, што *дэзінфекцыя*.

**АБ'Е́КТ** (ад лац. objectum прадмет), філасофская катэгорыя, якая ў *аб'ектыўнай рэальнасці* выражае тое, на што накіравана прадметна-практычная і пазнавальная дзейнасць суб'екта. А. не тоесны аб'ектыўнай рэальнасці, апошняя выступае для суб'екта як аб'ект не «ў чыстым выглядзе», а ў формах дзейнасці, мовы і ведаў, выпрацаваных



Лінзавыя фатаграфічныя аб'ектывы: *1* — «Трыплет»; *2* — «Індустар»; *3* — «Гіпергон»; *4* — «Арыён»; *5* — «Юпітэр»; *6* — шырокавугольны аб'ектыў Гіля.

гіст. развіццём грамадства. У найб. канцэнтраваным выглядзе гэта адлюстроўваюць існуючыя тэорыі пазнання, сярод якіх можна вылучыць: тыя, у якіх сцвярджаецца, што А., які пазнаецца, непасрэдна дадзены суб'екту і дзейнасць суб'екта заўсёды вядзе да адыходу ад А. і не вызначаецца прыродай самога А. (сузіральны матэрыялізм, сучасны рэалізм, *пазітывізм*, *фенаменалогія*), і тыя, дзе А. ёсць канструкцыя суб'екта, «аб'ектывацыя» ўнутр. зместу суб'екта (*кантыянства*, *неакантыянства*, *прагматызм*).

*Літ.*: Субъект и объект как философская проблема. Киев, 1979; Лекторский В.А. Субъект, объект, познание. М., 1980; Стереотипы и динамика мышления. Мн., 1993.

*У.К.Лукашэвіч.*

**АБ'Е́КТ ПРА́ВА**, пэўныя маёмасныя і немаёмасныя даброты і інтарэсы, паводле якіх адносіны рэгламентуюцца законам. А.п. з'яўляюцца палiт., працоўныя, гасп., сямейныя, зямельныя, маёмасныя і інш. адносіны. Прававыя нормы прадугледжваюць мадэль належных і магчымых паводзін членаў грамадства, правы і абавязкі дзярж. органаў, службовых асоб, грамадзян як удзельнікаў рэгулюемых грамадскіх адносін. З дапамогай прававых нормаў дзяржава прымушае іх выбіраць такі варыянт паводзін, які адпавядае інтарэсам грамадства. Не з'яўляюцца А.п. грамадскія адносіны неправавой прыроды— адносіны сяброўства, кахання, супрацоўніцтва і інш., што рэгулююцца нормамі маралі, рэлігіі, культуры і г.д.

**АБ'ЕКТЫВІ́ЗМ**, 1) кірунак у гнасеалогіі, у аснове якога ляжыць арыентацыя пазнавальнай дзейнасці на сац.-паліт. «нейтральнасць», на ўстрыманне ад сац.-крытычных ацэнак, суджэнняў аб яе каштоўнасцях і мэтах. Тым самым ён абмяжоўвае «разумнае мысленне», нярэдка маскіруючы гнасеалагічны *суб'ектывізм*. А. адмаўляе самаст. ролю актыўных дзеянняў гіст. суб'ектаў, трактуе іх як цалкам абумоўленыя фатальным ходам рэчаў, уплывам тэхніка-тэхнал. і навук. фактараў. У найноўшай сваёй форме *сцыентызму* А. выражаецца ў тэндэнцыі звесці ўсю культуру да навукі, а праблемы чалавека і грамадства — да навук.-тэхн. задач. 2) Кірунак у этыцы, які прызнае аб'ектыўныя каштоўнасці і прадпісанні і спрабуе ўстанавіць аб'ектыўны крытэрый і аб'ектыўную мэту маральнага дзеяння (гл. *Норма*).

*Літ.*: Поппер К. Логика и рост научного знания. М., 1983; Праблемы развіцця сучаснай філасофіі. Мн., 1994. *У.К.Лукашэвіч.*

**АБ'ЕКТЫ́Ў**, аптычная сістэма або яе частка, якая стварае сапраўдны адваротны відарыс аб'екта. Створаны А. відарыс разглядаецца праз *акуляр* (звычайна пасля *абарачальнай сістэмы*) ці фіксуецца на экране, фатагр. плёнцы, фотакатодзе перадавальнай тэлевізійнай трубкі і інш. Бываюць лінзавыя, люстраныя і люстрана-лінзавыя.

Асн. аптычныя характарыстыкі: фокусная адлегласць f; дыяметр уваходнай зрэнкі d; святласіла d/f; вугал (поле) зроку; *раздзяляльная здольнасць*. А. тэлескапічных сістэм маюць фокусную адлегласць да некалькіх метраў і дыяметр уваходнай зрэнкі ад некалькіх сантыметраў (у геад., вымяральных і падзорных трубах) да некалькіх метраў (у тэлескопах-рэфрактарах), А. мікраскопаў — фокусную адлегласць 1,5—40 мм, малафарматных фотаапаратаў — 6—2000 мм (для аматарскай практыкі 28—200 мм). Фатагр. А. бываюць нармальныя (вугал зроку 40—50°), шырокавугольныя (больш за 70°), звышшырокавугольныя (больш за 83°, А. тыпу «рыбіна вока» больш за 180°), даўгафокусныя (менш за 39°) і звышдаўгафокусныя (менш за 9°). Канструкцыя складаных А. дазваляе выправіць храматычную і геам. *аберацыі аптычных сістэм*. Большасць А. — *анастыгматы*. А. з пераменнай фокуснай адлегласцю (панкратычныя), у якіх плоскасць відарыса і святласіла нязменныя, выкарыстоўваюцца ў кіна- і тэлекамерах, спец. прамянёвастойкія — у лазерных сістэмах. Для павелічэння фіз. святласілы А. прасвятляюць (гл. *Прасвятленне оптыкі*).

*В.В.Валяўка.*

**АБ'ЕКТЫ́ЎНАЕ**, тое, што належыць самому *аб'екту*, існуе незалежна ад дзеючага суб'екта і яго свядомасці. Тэрмін А. мае некалькі аспектаў. Анталагічны ўключае ўяўленне аб А. як існуючым па-за чалавекам і чалавецтвам і незалежна ад іх (напр., памеры і канфігурацыі рэчаў як іх аб'ектыўныя ўласцівасці). Гнасеалагічны

Н.Г.Абель.

П.Абеляр.

звязаны з уяўленнем аб А. як уласцівасці ведаў, упэўненасці ў тым, што яны адлюстроўваюць аб'ект, які даследуецца, у сваіх асабістых характарыстыках (напр., найб. фундаментальныя характарыстыкі сістэм нежывой прыроды — скорасць святла, гравітацыйная пастаянная, у біял. відавой папуляцыі — суадносіны паміж асобінамі рознага полу). У аб'ектыўным ідэалізме А. — гэта ідэі і паняцці, што існуюць незалежна ад суб'екта. У грамадскім жыцці пад А. разумеюць працэсы і фактары, якія не залежаць ад волі і жаданняў людзей. А. з'яўляюцца сац. законы, хоць яны фарміруюцца праз механізм чалавечай дзейнасці. А. проціпастаўляецца *суб'ектыўнаму* і суб'ектыўна-асабоваму. Аднак такое проціпастаўленне не мае абсалютнага характару: тое, што ў адных адносінах з'яўляецца А., у іншых можа быць суб'ектыўным. *У.К.Лукашэвіч.*

**АБ'ЕКТЫ́ЎНАЯ І́СЦІНА**, гл. ў арт. *Ісціна.*

**АБ'ЕКТЫ́ЎНАЯ РЭА́ЛЬНАСЦЬ**, сукупнасць незалежных ад чалавечай свядомасці аб'ектаў, сувязяў, адносін, узаемадзеянняў, працэсаў, аб'яднаных у нежывыя, жывыя і сац.-арганізаваныя сістэмы. Жывыя сістэмы ўключаюць усю сукупнасць арганізмаў, здольных да самаўзнаўлення на аснове генетычнай інфармацыі. Сац.-арганізаваныя сістэмы — гэта сукупнасць індывідуумаў і іх згуртаванняў, якія падтрымліваюць сваё існаванне праз пераўтварэнне навакольнай рэчаіснасці. У структуру такіх сістэм уваходзяць таксама створаныя чалавекам тэхн. сістэмы, з дапамогай якіх ён больш паспяхова асвойвае рэчаіснасць. Унутраная падпарадкаванасць і сістэмная арганізацыя, якімі валодае А.р., законы яе эвалюцыі складаюць найважнейшы элемент даследаванняў. З улікам характару аспектаў А.р., якія даследуе тая ці інш. дысцыпліна, вылучаюць фіз. рэальнасць, біял. рэальнасць і г.д. і адпаведна карціну фіз. рэальнасці, карціну біял. рэальнасці і г.д. як найбольш буйныя блокі ведаў. Агульныя характарыстыкі А.р. адлюстроўвае агульнанавук. карціна сусвету.

*Літ.*: Идеалы и нормы научного исследования. Мн., 1981; Пригожин И., Сонгере И. Порядок из хаоса: Новый диалог человека с природой. М., 1986; Проблемы познания социальной реальности. М., 1990.

*У.К.Лукашэвіч.*

**АБ'ЕКТЫ́ЎНЫ ІДЭАЛІ́ЗМ**, гл. ў арт. *Ідэалізм.*

**АБЕЛЁВІЧ** Леў Майсеевіч (6.1.1912, Вільня — 3.12.1985), бел. кампазітар. Засл. дз. маст. Беларусі (1963). Вучыўся ў Варшаўскай кансерваторыі (1935—39), скончыў Бел. кансерваторыю

Абеліск ахвярам фашысцкага тэрору каля в. Вялікі Трасцянец Мінскага раёна. 1963.

(1941). Асн. дасягненні А. ў галіне лірыка-філас. сімфанізму. Муз. драматургія яго сімфоній вылучаецца канфліктнасцю, шматпланавасцю вобразнага развіцця. Значны ўклад А. ў вак. музыку. У творах 1970-х г. выявіліся рысы неакласіцызму.

*Тв.*: 4 сімфоніі (1962—1970), уверцюра (1955), «Гераічная паэма» (1957) і Сімф. карціны (1958) для сімф. арк.; канцэрт для фп. (1979) і вакаліз памяці Дз.Шастаковіча (1976) з сімф. арк.; арыя для скрыпкі і камернага арк.; санаты; фп. цыкл «Фрэскі»; паэма для голасу з фп.; зб. рамансаў і вак. цыклы на вершы М.Багдановіча, Я.Коласа, Ф.Цютчава, Р.Бёрнса, А.Пушкіна; «Партызанскія балады» на вершы А.Астрэйкі, М.Танка, У.Дубоўкі, «Ваенныя балады» на вершы розных паэтаў; хары, песні, музыка да радыёспектакляў.

*Літ.*: Калеснікава Н. Леў Абеліёвіч. Мн., 1970; Дубкова Т.А. Беларуская сімфонія. Мн., 1974. С. 162—186.

*Р.М.Аладава.*

**АБЕЛІ́СК** (грэч. obeliskos літар. невялікі ражон), гранёны каменны слуп, звычайна квадратны ў сячэнні, больш шырокі ўнізе і пірамідальна завостраны ўверсе. Пашыраны від помнікаў і манументаў з часоў Стараж. Егіпта. Нярэдка А. ў выглядзе калон ставілі ў памяць аб значных падзеях, для стварэння кампазіцыйных акцэнтаў у прасторавым вырашэнні арх. ансамбляў (А. на П'яцца дэль Попала ў Рыме, 1589, арх. К.Фантана). Форма А. выкарыстоўваецца ў мемарыялах (напр., шчыткі-пілоны, уласна А.), у помніках на ўшанаванне памяці і ўвекавечанне гераічных подзвігаў народа ў барацьбе супраць ням. фашыстаў (напр., *Манумент Перамогі* ў Мінску).

**А́БЕЛЬ** (Abel) Нільс Генрык (5.8.1802, каля г. Ставангер, Нарвегія — 6.4.1829), нарвежскі матэматык. Скончыў ун-т у Осла (1825), працаваў у ім і ў Інж. школе. Даказаў невырашальнасць у радыкалах агульных алг. ураўненняў вышэй за 4-ю ступень (1824). Адначасова з К.Якобі заклаў асновы тэорыі эліптычных функцый; даследаваў інтэгралы ад алг. функцый (абелевы інтэгралы). Аўтар даследавання па тэорыі лікаў і радоў. Працы пры жыцці не атрымалі прызнання.

*Літ.*: Оре О. Замечательный математик Н.Х.Абель: Пер. с англ. М., 1961.

**АБЕЛЯ́Р** (Abélard) П'ер (1079, Пале каля г. Нант, Францыя — 21.4.1142), французскі філосаф, багаслоў, паэт. Вучыўся ў Шартры і Парыжы. У 1113 адкрыў уласную школу. З 1119 манах. Асн. працы: «Дыялектыка», «Пазнай самога сябе», «Пра Божае адзінства і траістасць», «Так і не», «Дыялог паміж філосафам, іудзеем і хрысціянінам». У тэалогіі імкнуўся да рац. асэнсавання царк. дагматыкі. У спрэчках наміналізму з рэалізмам даказваў: рэальна існуюць толькі асобныя рэчы, агульныя ж паняцці — толькі ў свядомасці (прынцып канцэптуалізму). Распрацоўваў схаласт. логіку. Крытэрый маральных паводзін бачыў у згодзе з сумленнем як прыродным маральным законам, быў блізкі да ідэі верацярпімасці. Яго ідэі асуджаны Суасонскім (1121) і Санскім (1140) саборамі. Аўтар аўтабіягр. твора «Гісторыя Абеляравых бедстваў» (1132—36, рус. пер. 1902, 1959), любоўных вершаў, лістоў (да Элаізы) і інш. *Г.У.Грушавы.*

**А́БЕНДРОТ** (Abendroth) Герман (19.1.1883, Франкфурт-на-Майне — 29.5.1956), нямецкі дырыжор. З 1903 кіраўнік сімф. аркестраў у Мюнхене, Кёльне, Берліне і інш., з 1934 — аркестра Гевандхаўза і праф. кансерваторыі ў Лейпцыгу, з 1945 генерал-музік-дырэктар у Веймары, кіраўнік сімф. аркестраў радыё ў Лейпцыгу і Берліне. Вядомы як інтэрпрэтатар твораў Л.Бетховена, І.Брамса, А.Брукнера. Чл. Ням. акадэміі мастацтваў (ГДР). Нац. прэмія ГДР 1949.

**АБЕО́КУТА** (Abeokuta), горад на ПдЗ Нігерыі, на р. Агун. Адм. ц. штата Агун. Вузел чыгунак і аўтадарог. Засн. ў 1899.

377 тыс. ж. (1991). Прамысл. і гандл. цэнтр с.-г. раёна. Прадпр. па апрацоўцы какавы, пладоў алейнай пальмы, садавіны, арэхаў кола. Вытв-сць ірыгацыйнага і эл. абсталявання, абутку, пластмас, цэменту.

**АБЕ́Р** (Auber) Даніэль Франсуа Эспры (29.1.1782, г. Кан — 12.5.1871), французскі кампазітар. Чл. Ін-та Францыі (1829). Вучыўся ў Л.*Керубіні*. З 1842 дырэктар Парыжскай кансерваторыі, з 1857 узначальваў і імператарскую капэлу. Стварыў новы тып камічнай оперы з авантурна-прыгодніцкім сюжэтам, імклівым дзеяннем: «Фра-Д'ябала» (1830), «Бронзавы конь» (1835), «Чорнае даміно» (1837) і інш. Адзін з заснавальнікаў жанру вял. оперы [«Нямая з Портычы» («Фенела»), 1828].

**АБЕРА́ЦЫІ АПТЫ́ЧНЫХ СІСТЭ́М** (ад лац. aberratio адхіленне), скажэнні відарысаў у аптычных сістэмах. Абумоўлены недасканаласцю пераламляльных і адбівальных паверхняў аптычных сістэм, выкарыстаннем шырокіх пучкоў прамянёў нямонахраматычнага святла. Выяўляюцца ў парушэнні геам. падабенства відарыса і арыгінала або афарбоўцы відарыса. Адрозніваюць геам., храматычныя і дыфракцыйныя А.а.с.

Геаметрычныя выяўляюцца ў монахраматычным святле, падзяляюцца на *астыгматызм*, *дысторсію*, *кому* і сферычную аберацыю (відарыс пункта мае выгляд кружка рассейвання; абумоўлена тым, што вонкавыя і цэнтр. зоны лінзы са сферычнымі паверхнямі даюць відарыс у розных месцах аптычнай восі). Храматычныя ўзнікаюць у натуральным святле ў выніку неаднолькавага пераламлення прамянёў святла з рознай даўжынёй хвалі (адсутнічаюць у аптычных сістэмах з адбівальнымі паверхнямі); дыфракцыйныя — пры дыфракцыі святла на дыяфрагмах, аправах лінзаў і люстэркаў; абмяжоўваюць *раздзяляльную здольнасць* аптычнай прылады.

**АБЕРА́ЦЫЯ СВЯТЛА́** ў астраноміі, змена бачнага становішча свяціла на нябеснай сферы, абумоўленая канечнай скорасцю святла і ўзаемным перамяшчэннем крыніцы святла і назіральніка пры руху Зямлі ў прасторы. Адрозніваюць векавую А.с., выкліканую рухам Сонечнай сістэмы ў Галактыцы, гадавую — абарачэннем Зямлі вакол Сонца, сутачную — уласным вярчэннем Зямлі. Найб. значную А.с. (гадавую) адкрыў англ. астраном Дж.Брадлей (1725). Яна выклікае перамяшчэнне відарыса свяціла па эліпсе, вял. вось якога паралельна плоскасці экліптыкі і роўная прыблізна 20,5 .

**АБЕРА́ЦЫЯ ХРАМАСО́М**, гл. *Храмасомныя перабудовы*.

**А́БЕРДЗІ́Н**, Эбердзін (Aberdeen), горад у Вялікабрытаніі (Шатландыя). Адм. ц. раёна Грампіян. 216,9 тыс. ж. (1992). Порт на Паўночным м., вузел чыгунак і шашэйных дарог, у вусці р. Ды.

Засн. каля 700. Адзін з першых асяродкаў хрысціянства ў Шатландыі. У 12—14 ст. рэзідэнцыя шатл. каралёў. Пасля разбурэння англ. войскамі ў 1336 побач з старым пабудаваны новы А. У 1860 каралеўскі (1494) і маршальскі (1593) калегіумы аб'яднаны ва ун-т. Арх. помнікі 14—19 ст., у т.л. гатычны гранітны сабор (1336—1522).

Арганізацыйны цэнтр па абслугоўванні нафтаздабычы ў Паўночным моры. Рыбаперапр., цэлюлозна-папяровая, хім. (у т.л. вытв-сць угнаенняў) прам-сць, машынабудаванне. Каля А.— гранітныя кар'еры. Цэнтр турызму.

**А́БЕРДЗІ́Н**, Эбердзін (Aberdeen) Джордж Гамільтан Гордан (28.1.1784, г. Эдынбург — 14.12.1860), англійскі паліт. дзеяч. Адзін з лідэраў партыі *торы*, з 1850 лідэр *піліта́ў*. У 1852—55 прэм'ер-міністр кааліцыйнага ўрада, які ўключаў прадстаўнікоў торы, піліта́ў, *вігаў*, ірл. ліберала́ў. У 1854 урад А. аб'явіў вайну Расіі (гл. *Крымская вайна 1853—56*).

**АБЕРДЗІ́Н-АНГУ́СКАЯ ПАРО́ДА** буйной рагатай жывёлы.

Абердзін-ангуская парода буйной рагатай жывёлы.

Мяснога кірунку. Выведзена ў 18 ст. ў Шатландыі (графствы Абердзін і Ангус) удасканаленнем мясц. чорнай бязрогай жывёлы. Гадуюць у Расіі, Казахстане, на Украіне, у Аўстраліі, Аргенціне, ЗША, Канадзе, Вялікабрытаніі і інш. На Беларусі выкарыстоўвалася для прамысл. скрыжаванняў з малочнымі і малочна-мяснымі пародамі. Парода скараспелая, ёй уласціва ранняе адкладанне тлушчу і якаснае мяса з выражанай «мармуровасцю».

Жывёла з выразнымі мяснымі формамі і лёгкім касцяком. Характэрныя прыкметы — бязрогасць і чорная масць, якія ўстойліва перадаюцца патомству пры скрыжаваннях з інш. пародамі. Вызначаецца высокай пладавітасцю і лёгкасцю ацёлаў. Жывая маса нованарожаных цялят 25—28 кг, ва ўзросце 7 месяцаў 180—200, у 18 месяцаў 400—450 кг, дарослых кароў 450—500 і быкоў 750—900 кг. Забойны выхад дарослых жывёл 60%.

**А́БЕРКРАМБІ** (Abercrombie) Леслі Патрык (1879, г. Аштан-на-Мерсі, Вялікабрытанія — 23.3.1957), англійскі архітэктар і тэарэтык архітэктуры. Выкладаў у Ліверпульскім (1915—35) і Лонданскім ун-тах. Адзін з пачынальнікаў раённай планіроўкі гарадоў. У 1921—22 стварыў праект планіроўкі прамысл. раёна г. Донкастэр, які прадугледжваў буд-ва гарадоў-спадарожнікаў, функцыян. заніраванне тэрыторыі. У праекце развіцця «Вялікага Лондана» (1944) прапанаваў абмежаваць яго памеры «зялёным поясам» і пабудаваць 8 гарадоў-спадарожнікаў. Прэзідэнт Міжнар. саюза архітэктараў (1946—57).

**АБЕРО́Н**, спадарожнік планеты *Уран*. Дыяметр 1460 км, сярэдняя адлегласць ад цэнтра планеты 587 тыс. км. Плоскасць арбіты А. амаль перпендыкулярная плоскасці арбіты Урана. Адкрыў у 1787 У.*Гершэль*.

**АБЕРТО́Н** (ням. Oberton), 1) у фізіцы, простая (сінусаідальная) састаўная складанага вагання (мех., эл.) з частатой, вышэйшай за асноўную. Любое перыяд. ваганне выяўляецца як сума асн. тону і А. Амплітуда і частата А. вызначаюцца ўласцівасцямі вагальнай сістэмы і спосабам яе ўзбуджэння. А. з частотамі, кратнымі частаце асн. вагання, наз. гарманічнымі, інш. — негарманічнымі (уласцівыя гукам сірэн, шумам). Ад сукупнасці частот асн. вагання і А. залежыць тэмбр гуку. 2) У муз. акустыцы гарманічныя А., размешчаныя ва ўзыходным парадку, утвараюць *натуральны гукарад*. У комплексе з асн. тонам яны складаюць муз. гук і, хоць гучаць слабей за асн. тон і на слых не распазнаюцца, надаюць яму пэўную афарбоўку.

**АБЕ́ЧАК**, 1) канічны або цыліндрычны барабан без днішча з ліставога матэрыялу; загатоўка для катлоў, рэзервуараў і інш. ліставых металаканструкцый. 2) Лубяны абадок у рэшаце, сіце.

**АБЕШЭ́** (Abéché), горад на У Чада. Адм. ц. прэфектуры Вадаі. 83 тыс. ж. (1988). Вузел шашэйных дарог. Аэрапорт. Цэнтр жывёлагадоўчага раёна (пераважна буйн. раг. жывёла). Прадпрыемствы па перапрацоўцы с.-г. прадукцыі.

**АБ'ЁМ**, адна з колькасных характарыстык геам. цела; вымяраецца колькасцю змешчаных у целе кубаў з рабром, роўным адзінцы даўжыні. Для вымярэння А. складаных цел яны змяшчаюцца ў прамавугольны паралелепіпед, які разбіваецца плоскасцямі, паралельнымі яго граням, на n кубаў з рабром А.

Няхай Vn — сума А. кубаў, якія цалкам змяшчаюцца ў целе, а Wn — сума А. кубаў, што маюць хаця б адзін пункт цела. Калі граніцы V = lim Vn і W = lim Wn пры бязмежным змяншэнні А да 0 супадаюць, то іх агульнае значэнне V вызначае А. цела. Адзінка А. ў СІ 1 м$^3$.

**АБ'ЁМ УДЗЕ́ЛЬНЫ** рэчыва, фізічная велічыня (v), якая вызначаецца адносінамі аб'ёму V цела да яго масы m; адваротная *шчыльнасці*. Для аднароднага рэчыва v = V/m. Адзінка А.ў. ў СІ 1 м$^3$/кг.

**АБ'ЁМНАБЛО́ЧНАЕ ДОМАБУДАВА́ННЕ**, узвядзенне будынкаў з аб'ёмных бокаў поўнай заводскай гатоўнасці; адзін са спосабаў індустрыялізa-

цыі будаўніцтва. Асн. тыпы будынкаў: бескаркасныя буйнапанэльныя з аб'ёмнымі блокамі санітарных вузлоў, абсталяваных на заводзе; бескаркасныя з ужываннем аб'ёмных блокаў у спалучэнні з панэлямі (сотапанэльныя і аб'ёмнапанэльныя дамы); бескаркасныя з суцэльнай расстаноўкай аб'ёмных блокаў (памерам на пакой); каркасныя з запаўненнем каркаса саманоснымі аб'ёмнымі блокамі, якія ўстанаўліваюць на рыгелі ці стойкі каркаса (блокі з аблегчаных матэрыялаў).

А.д. на Беларусі вядзецца з 1960. Блокі выраблялiся з керамзітабетону, пазней пачалі ўжывацца састаўныя аб'ёмныя блокі. Ін-т «Белдзяржпраект» распрацаваў канструкцыі бескаркасных аб'ёмнаблочных будынкаў. Выкарыстоўваюцца прасторавыя каробкі тыпу «каўпак», «стакан» і інш. У параўнанні з буйнаблочным і буйнапанэльным буд-вам А.-д. зніжае расход матэрыялаў, працаёмістасць, кошт будоўлі, скарачае тэрмін выканання работ.

**АБ'ЁМНАЯ ПРУ́ГКАСЦЬ**, тое, што *сціскальнасць*.

**АБ'ЁМНАЯ СІ́ЛА**, тое, што *масавая сіла*.

**АБ'ЁМНАЯ ШТАМПО́ЎКА**, від *штампоўкі*, пры якой загатоўка прымае аб'ёмную форму рабочай поласці штампа. Пры гарачай А.ш. матэрыял награваюць да 200—1300 °С у полымных печах, індукцыйных або інш. тыпу ўстаноўках, затым апрацоўваюць на штамповачных молатах і прэсах (пры вырабе, напр., зубчастых колаў, каленчатых валоў). Пры халоднай А.ш. атрымліваюць вырабы з гладкай паверхняй (заклёпкі, цвікі, загатоўкі балтоў і інш.) пераважна на прэсавых аўтаматах.

**АБ'ЁМНЫ АНА́ЛІЗ**, сукупнасць метадаў хім. колькаснага аналізу, заснаваных на вымярэнні аб'ёмаў растворaў, газаў, асадкаў для вызначэння колькасці (канцэнтрацыі) пэўнага рэчыва. Уключае метады *тытрыметрычнага аналізу, газавага аналізу, ультрахімічнага аналізу*, а таксама асаджэнне. Раней да А.а. адносілі толькі тытрыметрыю.

**АБ'ЁМНЫ ЗАРА́Д**, тое, што *прасторавы зарад*.

**АБ'ЁМНЫ МО́ДУЛЬ**, функцыянальны вузел электроннага прыстасавання, у якім дыскрэтныя элементы (паўправадніковыя прылады, рэзістары, кандэнсатары і інш.) размешчаны паралельна адзін аднаму і перпендыкулярна плоскасці іх злучэння ў эл. ланцугі адпаведна схеме. Бываюць зварныя (вывады элементаў злучаны зваркай), калончатыя (элементы паміж друкавальнымі платамі), сотавыя (элементы ў спец. гнёздах з ізаляцыйнага матэрыялу) і інш. А.м. аднаго тыпу маюць аднолькавыя ці кратныя геам. памеры і ўтвараюць сістэму модуляў, дапасаваных паміж сабой па эл. параметрах.

**АБ'ЁМНЫ РЭЗАНА́ТАР**, парожні рэзанатар, эндавібратар, поласць з электраправоднай паверхняй, унутры якой устанаўліваюцца *свабодныя ваганні* эл.-магн. поля. Форма А.р. адвольная, практычнае выкарыстанне маюць прамавугольны паралелепіпед, круглы цыліндр, тароід, сфера. Спектр уласных частот А.р. і прасторавае размеркаванне эл.-магн. поля вызначаюцца пры рашэнні *Максвела ўраўненняў* з гранічнымі ўмовамі на сценках рэзанатара. Асн. характарыстыка — дыхтоўнасць, якая вызначаецца адносінамі вагальнай энергіі А.р. да страт энергіі за адзін перыяд ваганняў. Выкарыстоўваюцца ў тэхніцы звышвысокіх частот як контуры генератараў і хвалямераў, эталоны частаты, фільтры, у цыклічных паскаральніках зараджаных часціц і лазернай тэхніцы. Гл. таксама *Аптычны рэзанатар, Лазер*.

**АБ'ЁМНЫХ АДНО́СІН ЗАКО́Н**, гл. ў арт. *Гей-Люсака законы*.

**АБЗА́Ц** (ням. Absatz), 1) чырвоны радок — водступ у пачатковым радку тэксту. 2) Частка тэксту, звязаная сэнсавым адзінствам і вылучаная водступам у першым радку.

**АБЗУ́**, апсу, паводле шумера-акадскай міфалогіі, сусветны акіян падземных прэсных водаў, які абкружае зямлю, а таксама патаемнае месца, схаванае недзе ў яго глыбіні, куды нават багі не могуць зазірнуць і дзе захоўваюцца таямнічыя сілы, што кіруюць светам.

**АБІ́ДА**, возера ў Беларусі, у Крупскім р-не Мінскай вобл., бас. р. Югна, левага прытока Лукомкі. Пл. 0,64 км$^2$. Даўж. 1,5 км, найб. шыр. 0,7 км, найб. глыб. 17 м. Пл. вадазбору каля 330 км$^2$. Схілы спадзістыя, параслі хмызняком. Злучана шырокай пратокай з воз. *Сялява*.

**АБІ́ДАВІЧЫ**, вёска ў Беларусі, у Быхаўскім р-не Магілёўскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «XVIII партз'езд». За 30 км на ПдУ ад горада і чыг. ст. Быхаў, 60 км ад Магілёва, 3 км ад Дняпра. 747 ж., 288 двароў (1994).

У пісьмовых крыніцах упершыню згадваецца ў 16 ст., у 1600 сяло ў складзе маёнтка Тайманава Рэчыцкага пав. З 1742 у т.зв. Быхаўскім графстве, з 1772 у Старабыхаўскім (Быхаўскім) пав. Рас. імперыі. У 1880 у А. 790 ж. З 1924 цэнтр сельсавета ў Журавіцкім р-не, з 1935 у Доўскім (Журавіцкім), з 1956 у Быхаўскім р-не. У 1969 — 883 ж.

Сярэдняя і муз. школы, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі, камбінат быт. абслугоўвання, гандлёвы цэнтр. За 3 км на ПдЗ гарадзішча зарубінецкай і калочынскай культур (2 ст. да н.э.—3 ст. н.э.).

**А́БІДАС** (стараж.-грэч. Abidos), цяпер г. Арабет-эль-Мадфунах, адзін

**Аб'ёмнаблочнае домабудаванне.** Віды аб'ёмных блокаў: *1* — з прыстаўнымі тарцовымі сценамі; *2* — з панэлямі столі і вонкавай сцяны; *3* — з панэллю вонкавай сцяны; *4* — з панэллю столі тыпу «шклянка»; *5* — з панэллю падлогі тыпу «каўпак»; *6* — замкнёны маналітны блок; *7* — чатырохпавярховы блок з прыстаўнымі бакавымі сценкамі.

**Аб'ёмная штампоўка:** *1* — верхняя частка штампа; *2* — выраб ва ўнутранай частцы штампа; *3* — завусенец (лішак металу); 4 — ніжняя частка штампа.



**Аб'ёмны модуль** (без кажуха) — узмацняльнік гукавых частот: *1* — верхняя друкавальная плата; *2* — рэзістары; *3* — металічная перамычка паміж друкавальнымі платамі; *4* — кандэнсатар; *5* — ніжняя друкавальная плата; *6* — вывады; *7* — транзістар.

з найб. гарадоў Стараж. Егіпта, дзе, паводле легенды, быў забіты і пахаваны бог *Асірыс*. Гісторыя А. прасочваецца з сярэдзіны 4-га тыс. да н.э. У эпоху Сярэдняга царства (каля 2050—каля 1700 да н.э.) стаў гал. цэнтрам культу Асірыса, у выніку чаго ўзнік звычай рабіць у А. паломніцтва, хаваць там нябожчыкаў і ставіць памінальныя надпісы. Захаваліся рэшткі 2 храмаў, пабудаваных у гонар Асірыса фараонамі Сеці I (14 ст. да н.э.) і Рамсесам II (14—13 ст. да н.э.), а таксама кенатаф Сеці I.

**АБІДЖА́Н** (Abidjan), горад на Пд Котд'Івуар (да 1983 сталіца). Адм. ц. дэпартамента Абіджан. Засн. ў 1880—90. Каля 2 млн. ж. (1993, з прыгарадамі). Размешчаны на берагах і астравах лагуны Эбрые (Гвінейскі заліў). Міжнар. аэрапорт, гал. порт краіны. Пачатковы пункт чыгункі да г. Уагадугу (Буркіна-Фасо), вузел аўтадарог. Харчовая (рыбныя і садавінныя кансервы, сокі, піва, мука), тэкст., абутковая, швейная, дрэваапр., металаапр. (у т.л. аўта- і велазборачная), нафтаперапр., суднабуд. прам-сць. ЦЭС. Ун-т. Марская акадэмія навук. Нац. музей.

**АБІ́ДЗЕНСКІЯ ЭМА́ЛІ**, бронзавыя ўпрыгожанні (падвескі-лунніцы, пацеркі) позняга этапу *зарубінецкай культуры* (2—5 ст.), аздобленыя выемчатымі эмалямі. Выраблялі, як мяркуюць, у ювелірнай майстэрні на паселішчы *Адаменка* (Быхаўскі р-н, урочышча Абідня). Трохвугольныя лунніцы (верхні вугал служыў вушкам) знізу завершаны круглымі гнёздамі для чырвонай эмалі (плаўленае рымскае шкло). Кожны вугал упрыгожваюць яшчэ тры выступы-дыскі. Пацеркі ў форме сплюшчаных выцягнутых паралелепіпедаў. Аналагічныя ўпрыгожанні знойдзены і на суседнім паселішчы *Тайманава*.

*Літ.*: Поболь Л.Д. Славянские древности Белоруссии: (ранний этап зарубинецкой культуры). Мн., 1971.

*Л.Д.Побаль, М.М.Яніцкая.*

**А́БІ-ІСТАДА́**, запаведнік на Пд Афганістана, на Газні-Кандагарскім пласкагор'і. Засн. ў 1974. Пл. каля 25 тыс. га. Уключае мелкаводнае салёнае возера на выш. 2133 м — месцы жыхарства рэдкіх відаў птушак (гняздуецца фламінга, зімуе белы журавель).

**АБІСА́ЛЬ** (ад грэч. abyssos бяздонны), абісальная зона, зона марскога дна, якая адпавядае *ложу акіяна* (3000—6000 м). Займае больш за 75% пл. дна акіяна. Характарызуецца адносна слабай рухомасцю вады, адсутнасцю сонечнага святла, пастаяннымі т-рай (блізкай да 0 °С ці ніжэй), салёнасцю (каля 35%), велізарным ціскам у 30—60 МПа (300—600 атм). Жывёльны свет збяднелы (жывёлы сляпыя ці з вял. вачыма, многія арганізмы свецяцца). Зона найб. акіянскіх глыбінь — ультраабісаль (6—11 тыс. м) прымеркавана да акіянскіх жалабоў уздоўж мацерыкоў ці астраўных дуг.

**АБІСА́ЛЬНЫЯ АДКЛА́ДЫ**, асадкі, што намнажаюцца ў зоне *абісалі* мораў і акіянаў. Займаюць каля 90% пл. дна Сусв. акіяна. А.а. — арганагенныя мулы са шкілетных частак планктонных арганізмаў (глабігерынаў, дыятамей, радыялярый, фарамініфер і інш.), найдрабнейшых тэрыгенных часцінак, вулканічнага попелу, чырвоных глыбакаводных глін з уключэннямі жалеза-марганцавых канкрэцый і інш.

**АБІСА́ЛЬНЫЯ РАЎНІ́НЫ**, глыбакаводныя плоскія ці ўзгорыстыя раўніны акіянскіх катлавін і ўпадзін ускраінных мораў. Плоскія А.р. ўкрыты рыхлымі адкладамі; найб. пашыраны ў Атлантычным акіяне. Узгорыстыя маюць расчлянёны рэльеф, іх паверхня спалучае ўзгоркі, грады, лагчыны, асобныя горы, найб. іх у Ціхім і Індыйскім, менш у Атлантычным акіянах.

**АБІСІ́НІЯ**, старажытная неафіцыйная назва *Эфіопіі*. Паходзіць ад араб. слова

Залатыя завушніцы Рамсеса II, знойдзеныя ў Абідасе.

Да арт. **Абідзенскія эмалі**. Лунніца з чырвонай эмаллю 3—4 ст.

«аль-хабаша», якім называлі гэту краіну ў стараж. часы арабы.

**АБІСІ́НСКАЕ НАГО́Р'Е**, гл. *Эфіопскае нагор'е*.

**А́БІСКУ**, Абіска (Abisko), нацыянальны парк на Пн Швецыі, у Скандынаўскіх горах. Засн. ў 1909 як ландшафтны запаведнік. Уключае бас. р. Абіску і ч. паўд. ўзбярэжжа воз. Турнетрэск. Пл. 7,5 тыс. га. Хваёвыя і мяшаныя лясы. Разнастайная фауна млекакормячых (буры мядзведзь, воўк, лемінг, лось, паўн. алень, пясец, расамаха) і птушак (бакас, беркут, варакушка, курапатка палярная, паморнік даўгахвосты, пуначка, сава белая, уюрок). На тэр. парку навук.-даследная станцыя Шведскай АН.

**АБІТУРЫЕ́НТ** [ад позналац. abituriens (abiturientis) які збіраецца пайсці], у большасці краін асоба, якая заканчвае сярэднюю спец. навуч. ўстанову. На Беларусі і ў інш. краінах СНД з канца 1950-х г. тэрмін «А.» набыў інш. сэнсавае значэнне — які паступае ў вышэйшую або сярэднюю спец. навуч. ўстанову.

**А́БІХ** (Abich) Вільгельм Герман (Герман Вільгельмавіч; 11.12.1806, Берлін — 1.7.1886), геолаг. Акад. (1853), ганаровы чл. (1866) Пецярбургскай АН. Праф. Дэрпцкага (г. Тарту) ун-та. У 1841—76 працаваў у Расіі. Вывучаў ледавікі, геал. будову, карысныя выкапні, землетрасенні Каўказа і Ірана. Адзін з першых звярнуў увагу на хімізм горных парод і значэнне палявых шпатаў у складзе вывергнутых парод.

**А́БІХТ** Генрык Тэадоравіч (1835 ці 1836, Вільня — 12.6.1863), удзельнік нац.-вызв. руху 1850—60-х г. на Беларусі, у Польшчы, Літве. Скончыў Віленскую гімназію (1852), служыў паштовым чыноўнікам. Каб пазбегнуць арышту за ўдзел у рэв. гуртках, у 1857 эмігрыраваў у Лондан. Быў актыўным дзеячам польскай *Рэвалюцыйнай грамады «Лондан»*, працаваў у друкарні «Колокола». Вясной 1862 нелегальна прабраўся ў Варшаву. Уваходзіў у лявіцу *«чырвоных»*, быў агентам *Цэнтральнага нацыянальнага камітэта*. Асн. рухальнай сілай паўстання лічыў народ. У ліст. 1862 арыштаваны, зняволены ў Брэсцкую крэпасць. Павешаны ў Варшаўскай цытадэлі.

*Літ.*: Кісялёў Г. Вязень Брэсцкай крэпасці // Кісялёў Г. Героі і музы. Мн., 1982.

*Г.В.Кісялёў.*

**А́БІХТ** (Abicht) Рудольф (9.8.1850, г. Намыслаў, Польшча — 12.2.1921), нямецкі філолаг-славіст, адзін з першых даследчыкаў і папулярызатараў бел. культуры ў Германіі. З 1900 праф. слав. філалогіі Вроцлаўскага (Брэслаўскага) ун-та. У працах «Паказальнік крыніц Супрасльскага рукапісу» (1893—98), «Слова аб палку Ігаравым» (1895) даследаваў стараж.-бел. помнікі. Бел. матэрыялы і пераклады друкаваў у газ. «Гоман», «Deutschland» («Германія»), «Wilensker Zeitung» («Віленская газета»)

і інш. У сааўт. з Я.Станкевічам выдаў бел. буквар «Просты спосаб стацца ў кароткім часе граматным» (Вроцлаў, 1918); пры яго садзейнічанні выйшаў зб. «Беларусь» (Берлін, 1919).

**АБІЯГЕНЕ́З** (ад *а...* + *біягенез*), утварэнне арган. злучэнняў, пашыраных у жывой прыродзе, па-за арганізмам і без удзелу ферментаў. У шырокім сэнсе А.— узнікненне жывога з нежывога, зыходная гіпотэза сучаснай тэорыі *паходжання жыцця* на Зямлі абіягенным шляхам (належыць А.І.Апарыну і Дж.Холдэйну). Магчымасць А. ўпершыню даказана ў 19 ст. штучным сінтэзам мачавіны. У сярэдзіне 20 ст. эксперыментальна ажыццёўлены абіягенны сінтэз бялковападобных і інш. арган. рэчываў ва ўмовах, якія ўзнаўляюць умовы першабытнай Зямлі. Гл. таксама *Біягенез*.

**АБІЯ́НІК**, шугалея, лодка, выдзеўбаная з дубовага ствала, з набітымі дашчанымі бартамі. Была найб. пашырана на Бел. Палессі. Грузападымальнасць 1,5—4,5 т. Мела паветку (з рагожы, палатна, скуры і да т.п.). У яе канструкцыі адлюстраваўся пераход ад *аднадрэвак* да дашчаных лодак. Выйшла з ужытку на пач. 20 ст.

**АБІЯТЫ́ЧНАЕ АСЯРО́ДДЗЕ** (ад *а...* + грэч. bios жыццё), сілы, з'явы, аб'екты прыроды, якія акружаюць жывыя арганізмы і паходжаннем не звязаны з іх жыццядзейнасцю (гл. *Абіятычныя фактары*). У выніку гіст. развіцця ў канкрэтных умовах арганізмы прыстасоўваюцца да пэўнага комплексу фактараў і ў працэсе жыццядзейнасці самі змяняюць А.а. Вытв. і быт. дзейнасць чалавека адмоўна ўздзейнічае на А.а., таму неабходна прымаць меры па захаванні асяроддзя ў натуральным стане, стварэнні лепшых умоў існавання арганізмаў.

**АБІЯТЫ́ЧНЫЯ ФА́КТАРЫ**, сукупнасць умоў неарган. асяроддзя, якія ўплываюць на арганізмы і іх згуртаванні. Падзяляюцца на хімічныя (хім. састаў атмасферы, марскіх і прэсных водаў, глебы або донных адкладаў) і фізічныя — кліматычныя (т-ра, вільготнасць, бараметрычны ціск, вецер, цячэнні, радыяцыйны рэжым, колькасць ападкаў, ступень асветленасці і інш.). Фарміруюць умовы пражывання чалавека, жывёл, раслін і мікраарганізмаў, вызначаюць занальнасць пашырэння, уплываюць на біял. рытмы, дынаміку іх колькасці.

**АБКА́ЙК**, нафтавае радовішча ў Саудаўскай Аравіі, адно з буйнейшых у свеце. Уваходзіць у *Персідскага заліва нафтагазаносны басейн*. Адкрыта ў 1940, распрацоўваецца з 1946. Пачатковыя прамысл. запасы нафты 1210 млн. т. Прадукцыйныя залежы на глыб. 1,7—2 км. Шчыльнасць нафты 880 кг/м$^3$. Дзесяткі фантануючых свідравін. Нафтаправоды да Сайды (Ліван) і партоў Рас-Танура і Ямбу. Эксплуатуецца кампаніяй «Арамка».

Абклад абраза Антонія Падуанскага. Астравецкі раён Гродзенскай вобласці. 18 ст.

Абклад Евангелля з г.Ляхавічы. 18 ст.

**АБКЛА́Д**, дэкаратыўная аздоба *абраза* ці кніжнага пераплёту. Найчасцей А. рабілі з пазалочанай медзі або серабра, арнаментавалі чаканкай, філігранню, чарненнем, эмалямі, упрыгожвалі каштоўнымі камянямі. Існавалі А. таксама з дрэва, маст. тканін, якія закрывалі адзенне, галаўныя ўборы (такія А. наз. «шата»), радзей — фон на абразах. Узнікненне кніжных А. са слановай косці адносяць да 7—8 ст., металічных— да 9—10 ст. На Беларусі вядомы сярэбраны А. Лаўрышаўскага евангелля (14 ст.). Найб. пашырэнне тут атрымаў у 17—19 ст. У 17 ст. найчасцей А. аздаблялі шанаваныя ці цудатворныя абразы (Брэст, Гродна, Мінск, Жыровічы, Лагішын і інш.). Значнымі маст. цэнтрамі, дзе ствараліся А., былі Вільня, Магілёў, Мінск, Пінск, Слуцк і інш. Іх рабілі бел. майстры Максім Сямёнаў (Куцень), Фёдар Мікулаеў і інш., якія працавалі ў Залатой і Сярэбранай палатах Маскоўскага Крамля (гл. ў арт. *Аружэйная палата*). Найб. вядомыя сярэбраныя пазалочаныя А. да абразоў: «Маці Божая Бялыніцкая» (Нясвіжскі р-н, 18 ст.), «Маці Божая з езуіцкімі святымі» (Ляхавіцкі р-н, 18 ст.), «Маці Божая Адзігітрыя Смаленская» (Міёрскі р-н, 1774), медныя пасярэбраныя да абразоў «Пакланенне вешчуноў» (Браслаўскі р-н, 18 ст.), «Маці Божая Апека» (Пінскі р-н, 18 ст.), «Маці Божая Замілаванне» (Пінскі р-н, 1803), разны драўляны да абраза «Маці Божая Адзігітрыя» (Драгічынскі р-н, 2-я пал. 17 ст.) і інш.

*Літ.*: Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Беларусі XII—XVIII стагоддзяў / Скл. Н.Ф.Высоцкая. Мн., 1984. *А.А.Ярашэвіч.*

**АБКЛА́ДКА** падземнага збудавання, канструкцыя для замацавання падземных выработак і ўтварэння ўнутранай паверхні падземных збудаванняў. Форма і памеры А. залежаць ад прызначэння збудавання: для *метрапалітэна*, вадавода, тунэля, падземнай ГЭС і інш. Бывае апорная (разлічана на ўздзеянне нагрузкі) і абліцовачная (для аховы горных парод ад разбурэння); з маналітнага бетону або жалезабетону, зборнага жалезабетону, металу, таксама і камбінаваная, з абліцоўкай дэкар. матэрыяламі.

**АБЛАВУ́ХА**, бел. мужчынскі галаўны ўбор, зімовая шапка-вушанка з аўчыны або заечага, лісінага, вавёрчынага ці трусінага футра, пацягнутая зверху сукном. Да асновы яе прышывалі 4 крылы (вушы), пярэдняе і задняе падымалі і звязвалі зверху, бакавыя апускалі ці падвязвалі пад падбародкам. Насілі да пач. 20 ст.

**АБЛАКЦІРО́ЎКА** [ад лац. ab ад + lac (lactis) малако], спосаб *прышчэплівання*, пры якім 2 парасткі злучаюцца без аддзялення іх ад мацярынскіх раслін. Праводзіцца ў перыяд вегетацыі кустоў, лепш з мая да пачатку выспявання парасткаў. Пасля поўнага зрошчвання прышчэпак аддзяляецца ад мацярынскай расліны, застаючыся на прышчэпе. Адзін з асн. спосабаў размнажэння культ. сартоў у пладова-ягадных гадавальніках.

**АБЛА́М**, забарол, невысокая (каля 1,5 м) надбудова над абарончымі сценамі і вежамі драўляных замкаў Беларусі ў 16—17 ст. Служыў пагрудным прыкрыццём для абаронцаў. Меў выгляд верт. сценкі з 3—7 вянкоў, якая апіралася на кансольныя выпускі бэлек гарадзен, тарасаў і вежаў і выступала за сцены ніжніх ярусаў. Па бэльках насцілаўся верхні баявы мост з падсябіцямі. Прарэзаны байніцамі А. часам завяршаўся дахам і ствараў крытую баявую галерэю, напр., у *Віцебскіх замках*.

**АБЛАМЕ́ЙКА** Сяргей Уладзіміравіч (н. 24.9.1956, г.п. Воранава Гродзенскай вобл.), бел. вучоны ў галіне тэхн. кібернетыкі. Д-р тэхн. н. (1990), праф. (1992). Скончыў БДУ (1978). З 1978 у Ін-це тэхн. кібернетыкі АН Беларусі, адначасова з 1987 у БДУ. Навук. працы па штучным інтэлекце, апрацоўцы відарысаў і распазнаванні вобразаў, сістэмах машыннага зроку.

*Тв.*: Обработка и отображение информации в растровых графических системах. Мн., 1989 (у сааўт.).

**АБЛАСНЫ́ ВЫКАНА́ЎЧЫ КАМІТЭ́Т САВЕ́ТАЎ РАБО́ЧЫХ, САЛДА́ЦКІХ І СЯЛЯ́НСКІХ ДЭПУТА́ТАЎ ЗАХО́ДНЯЙ ВО́БЛАСЦІ І ФРО́НТУ**, Аблвыкамзах, першы вышэйшы заканадаўчы (паміж з'ездамі Саветаў) орган сав. улады ў *Заходняй вобласці* і на Зах. фронце. Дзейнічаў з 26.11(9.12).1917 да 2.1.1919 у Мінску (з 19.2.1918 — у Смаленску). Створаны ў выніку зліцця выканкомаў абл. Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў, Савета сял. дэпутатаў Мінскай і Віленскай губ. і Франтавога к-та Зах. фронту; уключаны і 17 прадстаўнікоў прафсаюзаў. Узначальваў ваенна-паліт. і гасп. жыццё Зах. вобласці і фронту. Складаўся з 15 камісарыятаў (аддзелаў). Прэзідыум: старшыня М.У.Рагазінскі, з 30.1.1918 А.Ф.Мяснікоў; таварышы старшыні М.І.Крывашэін, П.Казлоў; сакратары І.Я.Алібегаў, Гарашчук, П.Осіпаў. Для каардынацыі дзейнасці камісарыятаў і вырашэння найб. важных пытанняў створаны *Савет Народных Камісараў Заходняй вобласці і фронту*. Друк. органы — газ. «Советская правда», «Западная коммуна». Ліквідаваны ў сувязі са стварэннем *Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі*.

*Літ.*: Нестеренко Е.И., Осмоловский В.П. Советы Белоруссии, окт. 1917 — янв. 1919 г. Мн., 1989.

**АБЛАСНЫ́ СЛО́ЎНІК**, тое, што *дыялектны слоўнік*.

**АБЛАСНЫ́ СУД** на Беларусі, судовы орган, які дзейнічае на тэр. вобласці ў якасці першай, касацыйнай і наглядная інстанцый. Складаецца са старшыні, яго намеснікаў і членаў суда, якія назначаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. Мае суд. калегіі па цывільных і крымін. справах і прэзідыум. Як суд 1-й інстанцыі разглядае цывільныя і крымін. справы, аднесеныя законам да яго вядзення, як касацыйная інстанцыя — справы па скаргах і пратэстах на рашэнні, прыгаворы і вызначэнні нар. судоў, якія не набылі законнай сілы. Прэзідыум А.с. разглядае ў парадку нагляду справы па пратэстах



Уніфікаваная зборная жалезабетонная абкладка тунэляў метрапалітэна: *а* — з блокаў кругавога абрысу; *б* — з прамавугольных блокаў.

Аблавуха.

на рашэнні, прыгаворы, вызначэнні нар. судоў, пастановы нар. суддзяў, якія набылі законную сілу, на касацыйныя вызначэнні калегій А.с., а таксама справы па новаадкрытых акалічнасцях. Паўнамоцтвамі А.с. валодае і Мінскі гар. суд. *І.І.Пацяружа.*

**АБЛАСНЫ́Я ПАДПО́ЛЬНЫЯ КАМІТЭ́ТЫ КП(б)Б** у Вялікую Айчынную вайну, кіруючыя парт. органы на тэр. Беларусі, акупіраванай ням.-фаш. захопнікамі. Дзейнічала 10 А.п.к.: Гомельскі, Мінскі (з 1941), Віцебскі, Пінскі (з 1942), Баранавіцкі, Беластоцкі, Брэсцкі, Вілейскі, Магілёўскі і Палескі (з 1943). Узначальвалі дзейнасць падп. 11 міжрайкомаў, 6 міжрайпартцэнтраў, 8 гаркомаў, 2 гаркомаў-райкомаў, 166 райкомаў КП(б)Б (у т.л. 5 райкомаў г. Мінска), якія аб'ядноўвалі больш за 1200 пярвічных парт. арг-цый у партыз. фарміраваннях і 184 тэр. падп. парт. арг-цыі, больш за 35 тыс. камуністаў. Дыслацыраваліся ў зонах буйных партыз. фарміраванняў. Мелі друкаваныя органы (гл. ў арт. *Друк падпольны*).

**АБЛАСНЫ́Я ПАДПО́ЛЬНЫЯ КАМІТЭ́ТЫ ЛКСМБ** у Вялікую Айчынную вайну, кіруючыя камсамольскія органы на тэр. Беларусі, акупіраванай ням.-фаш. захопнікамі. Дзейнічала 10 А.п.к.: Гомельскі, Пінскі (з 1941), Віцебскі, Магілёўскі (з 1942), Баранавіцкі, Беластоцкі, Брэсцкі, Вілейскі, Мінскі, Палескі (з 1943). Накіроўвалі дзейнасць падп. 6 міжрайкомаў, 5 міжрайцэнтраў, 13 гаркомаў, Лідскага гаркома-райкома, 189 райкомаў ЛКСМБ, якія аб'ядноўвалі больш за 2500 пярвічных арг-цый у партыз. фарміраваннях, каля 3 тыс. падп. камсамольскіх і 335 маладзёжных антыфаш. арг-цый, амаль 80 тыс. камсамольцаў-партызан і больш за 20 тыс. камсамольцаў-падпольшчыкаў. Некат. абкомы мелі друкаваныя органы (гл. ў арт. *Друк падпольны*).

**АБЛАСНЫ́Я ПРЫВІЛЕ́І**, заканадаўчыя акты ВКЛ, якія юрыдычна замацоўвалі аўтаномныя правы некат. зямель (княстваў, ваяводстваў, паветаў). Даваліся вял. князем ВКЛ. Грунтаваліся на мясц. *звычаёвым праве*, а таксама выпрацоўваліся адм. і судовай практыкай. Найб. вядомыя А.п.: Віцебскія 1503, 1509, 1561; Полацкія 1511, 1547, 1580, 1634, 1699; Смаленскі 1505; Кіеўскія 1507, 1529; Валынскія 1501, 1509, 1547; Бельскія 1501, 1547; Драгічынскія 1511, 1547; Мсціслаўскі 1551.

Найб. тыповыя А.п. — Віцебскі 1503 і Полацкі 1511. У іх замацаваны старадаўняе абавязацельства вял. князя не ўмешвацца ў царк. справы палачан і віцяблян, гарантаваны іх маёмасныя і асабістыя правы. Ваяводы ў Полацк і Віцебск павінны былі прызначацца толькі са згоды мясц. насельніцтва. Судзіць палачаніна можна было толькі ў Полацку паводле полацкага права. За баярамі і мяшчанамі гэтых зямель прызнавалася права свабоднага выезду за мяжу.

*Літ.*: Юхо Я.А. Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі. Мн., 1992.

*І.А.Юхо.*

**АБЛВЫКАМЗА́Х**, скарочаная назва *Абласнога выканаўчага камітэта Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў Заходняй вобласці і фронту.*

**АБЛЕДЗЯНЕ́ННЕ**, адкладанні лёду на паверхні збудаванняў, дрэвах, правадах, дарогах і інш. аб'ектах. Утвараецца ў выніку выпадзення вадкіх ападкаў у халодную пару года, у туман, смугу. Адрозніваюць *галалёд*, зярністую і крышталічную *шэрань*, замёрзлае адкладанне мокрага снегу, складаныя адклады — з некалькіх слаёў розных відаў. На Беларусі за год колькасць сутак з А. складае ў паніжаных месцах 20—28, на ўзвышшах да 40. Назіраецца з кастр. да крас., часцей за ўсё ў снеж. і студзені. Працягласць яго звычайна да 12 гадз. Самым працяглым на Беларусі было ў Навагрудку 28.12.1959—27.1.1960 (715 гадз). Небяспечная з'ява для работы транспарту, энергасістэм і інш. галін гаспадаркі.

**АБЛІВА́ННЕ**, лячэбна-прафілактычная водная працэдура для загартоўвання арганізма; назначаецца таксама ў пачатку *водалячэння*. А. праводзяць 2—3 мін кожны дзень на працягу 4—6 тыдняў, паступова зніжаючы т-ру вады з 34—33°С да 22—20 °С. Потым усё цела расціраюць сухой, лепш нагрэтай прасціной.

**АБЛІГА́ЦЫЯ** (ад лац. obligatio абавязацельства), каштоўная папера ў выглядзе даўтавога абавязацельства, якое дае ўладальніку права на атрыманне штогадовага даходу ў выглядзе працэнта ці выйгрышу ў спец. тыражы. Выпускаюцца дзяржавай, банкамі, прадпрыемствамі, карпарацыямі, з'яўляюцца каштоўнымі паперамі на прад'яўніка, свабодна абарачаюцца на фін. рынку і маюць свой курс. Пасля заканчэння прадугледжанага тэрміну А. выкупляюцца эмітэнтам. Сродкі ад іх выпуску дзяржава выкарыстоўвае на пакрыццё дзярж. расходаў, рэгуляванне грашовага абарачэння. Для прадпрыемстваў, фінансава-крэдытных устаноў А. — адзін са спосабаў мабілізацыі дадатковых фін. рэсурсаў. У адрозненне ад уладальнікаў *акцый*, уладальнікі А. з'яўляюцца толькі крэдыторамі, а не сяўладальнікамі (акцыянерамі) кампаніі, банка і г.д. *Г.І.Краўцова.*

**АБЛІТЭРА́ЦЫЯ** (ад лац. obliteratio сціранне, згладжванне), 1) у жывёл і чалавека — прыроджанае або набытае зарастанне поласці ці прасвету трубкавага органа, канала, крывяноснага або лімфатычнага сасуда (напр., пры запаленнях, трамбозах). 2) У расліна — сплюшчванне клетак і тканак, якое вядзе да знікнення ўнутрыклетачных і міжклетачных поласцей (напр., перыферычных слаёў лубу пры разрастанні тканак сцябла, абалонак і тканак зародка пры яго росце).

**АБЛІЦО́ВАЧНЫЯ МАТЭРЫЯ́ЛЫ**, разнавіднасць *аддзелачных матэрыялаў*. Адрозніваюць А.м. прыродныя і штучныя, для ўнутраных і вонкавых *аблiцовачных работ*. Да прыродных належаць пліты і камяні з граніту, габра, лабрадарыту, вапняку, мармуру, туфу, пясчаніку і інш. горных парод. Штучныя А.м. — керамічныя плітки і камяні, вонкавая цэгла, вырабы са шкла (лісты, шклаблокі, дыванова-мазаічныя плітки, панэлі са шклопрафіліту, пліты з сіталаў, шклосіталаў), мармуру штучнага, драўнінна-валакністыя і драўнінна-стружкавыя пліты. Выкарыстоўваюць лісты з азбестацэменту, шклапластыкаў, дэкар. фанеры, рулонныя, ліставыя і плітачныя палімерныя матэрыялы, дэкар.-акустычныя пліты. Фасады будынкаў аблiцоўваюць таксама прафіляванымі вырабамі з алюмінію, сталі і дэкар. бетону.

**АБЛІЦО́ВАЧНЫЯ РАБО́ТЫ**, аддзелка вонкавых і ўнутр. паверхняў збудаванняў ліставымі і плітачнымі матэрыяламі, разнавіднасць *аддзелачных работ*. Павышаюць даўтавечнасць і паляпшаюць архітэктурна-маст. выразнасць будынкаў. Асн. аперацыі: сартаванне і падрыхтоўка *аблiцовачных матэрыялаў*, прыгатаванне буд. растворaў, клеяў і масцік, падрыхтоўка і разметка паверхні, уласна аблiцоўка. Вонкавыя А.р. выконваюць адначасова з муроўкай сцен ці пасля іх узвядзення, унутраныя праводзяць па заканчэнні агульных буд. работ. Адзін з відаў А.р. — мазаічнае пакрыццё (гл. ў арт. *Мазаіка*).

**АБЛО́ГА**, 1) спосаб вядзення ваен. дзеянняў па авалоданні крэпасцю ці ўмацаваным горадам. Праводзілася ў выпадку, калі крэпасць або горад не былі захоплены раптоўна або штурмам. Уключала акружэнне крэпасці войскамі, узвядзенне вакол яе аблогавых умацаванняў, правядзенне атак, якія звычайна заканчваліся штурмам. Часам А. прымала форму *блакады*. Вядома з глыбокай старажытнасці: А. Бактры (Егіпет; 2130 да н.э.), Троі (каля 1260 да н.э.); Полацка (1579), *Быхава аблога 1654—55* і інш., Плеўны (1877). У 18 — пач. 20 ст. для А. ствараліся спец. армії:

Да арт. **Аблога**. «Аблога Полацка войскамі Стафана Баторыя ў 1579». З гравюры С.Пахалавіцкага.

яп. аблогавая армія пад Порт-Артурам (1904), ням. і рус. аблогавыя арміі ў 1-ю сусв. вайну (1914—18) пры А. Льежа, Намюра, Перамышля. Пасля І-й сусв. вайны тэрмін «А.» не выкарыстоўваецца. 2) Спосаб палявання (на ваўка, мядзведзя і інш.).

**АБЛО́ГА** ў аграноміі, ворная зямля, якая не выкарыстоўваецца доўгі час на с.-г. мэты. Кароткачасовая (8—15 гадоў) А. ў стэпавых раёнах наз. пералог, у лесастэпавых — залог. У першыя 2—3 гады ралля зарастае адна- і двухгадовымі раслінамі (бур'яністы пералог), у наступныя 5—7 гадоў — карэнішчавымі раслінамі, рыхла- і шчыльнакустовымі злакамі. Пазней развіваецца расліннае покрыва, характэрнае для сухадольных лугоў, пад ім назапашваецца арган. рэчыва і аднаўляецца прыродная ўрадлівасць глебы. На Беларусі А. займаюць нязначныя плошчы пераўвільготненых і цяжкадаступных малапрадукцыйных зямель.

**АБЛО́ГАВАЯ ТЭ́ХНІКА**, машыны, прылады, прыстасаванні, якія ў стараж. часы выкарыстоўвалі для прыкрыцця атакуючых, штурму і разбурэння ўмацаванняў. Уключала пераносныя і рухомыя (на катках) шчыты, *вінеі*, рухомыя аблогавыя вежы ў некалькі ярусаў з адкіднымі мосцікамі, штурмавыя драбіны, кідальныя машыны, *тараны* і інш. На Беларусі А.т. выкарыстоўвалася да 14—15 ст., калі на змену ёй стала прыходзіць аблогавая артылерыя.

**АБЛО́МКАВЫЯ ГО́РНЫЯ ПАРО́ДЫ**, кластычныя горныя пароды, асадкавыя горныя пароды, якія складаюцца з абломкаў больш стараж. горных парод і мінералаў. Адрозніваюць А.г.п. сцэментаваныя і несцэментаваныя (рыхлыя). Па велічыні абломкаў вылучаюцца грубаабломкавыя пароды, або псефіты (несцэментаваныя — глыбы, *валуны*, *галька*, *друз*, жарства, жвір і сцэментаваныя — *кангламераты*, *брэкчыі*, *гравеліты* і інш.); пясчаныя (*псаміты*), пылаватыя (*алеўрыты*, *алеўраліты*), гліністыя (*пеліты*) пароды, а таксама мяшаныя (суглінкі і супескі). Да А.г.п. належаць таксама прадукты вулканічных вывяржэнняў: вулканічны друз, попел, туфабрэкчыі і інш. Выкарыстоўваюць у буд-ве, металургічнай, шкляной, керамічнай прам-сці і інш. У рачных і марскіх пясках трапляюцца золата, плаціна, каштоўныя камяні, разнастайныя мінералы, руды каляровых, рэдкіх і радыеактыўных металаў. А.г.п. пашыраны па ўсёй Беларусі. Многія з іх (пяскі, жвір і інш.) — карысныя выкапні.

**АБЛО́МЫ АРХІТЭКТУ́РНЫЯ**, працяглыя элементы арх. пластыкі, спалучэнне якіх складае профілі (разрэзы) карнізаў, капітэляў, базаў калон. Размяшчаюцца па гарызанталі, радзей па нахіленай крывой (у архівольтах арак, на нервюрах) ці ламанай (абрамленні парталаў, вокнаў) лініі. Узбагачаюць арх. дэкор, узмацняюць вобразна-маст. выразнасць будынка. Падзяляюцца на прамалінейныя (палічка) і крывалінейныя (вал, гусёк, абцасік і інш.). Найб. пашыраны ў ордэрнай архітэктуры (гл. *Ордэр*). Узніклі ў класічнай архітэктуры Стараж. Грэцыі, адкуль запазычаны дойлідствам Стараж. Рыма і Візантыі, пасля — Зах. Еўропы. У сучаснай архітэктуры А.а. адпавядаюць *профілі архітэктурныя*.

**АБЛЫСЕ́ННЕ**, пляшывасць, алапецыя, парадзенне, поўнае або частковае выпадзенне (адсутнасць) валасоў. Лакалізуецца пераважна на галаве; можа быць часовым і стойкім. Пашыраная з'ява ў старэчым узросце, у перыяд старэчай інвалюцыі. Спрыяюць А. нервова-псіхічныя і эндакрынныя захворванні, хваробы і пашкоджанні скуры, радыеактыўнае апрамяненне, інтаксікацыі. Прыроджанае А. — у асноўным спадчынная хвароба, трапляецца рэдка; набытае А. назіраецца пераважна ў мужчын, у жанчын у асноўным праяўляецца толькі парадзеннем валасоў. Адрозніваюць таксама гнездавое А.— выпадзенне валасоў на адным або некалькіх абмежаваных участках скуры, татальнае — на ўсёй галаве і на інш. участках цела, рубцаватае — на зменены участках скуры (напр., пры фурункулёзе, траўмах, грыбковых хваробах і г.д.). А. бывае і ў дзяцей. На лячэнне выкарыстоўваюць сасударасшыральныя прэпараты, глюкакартыкоідныя гармоны, агульнаўмацавальныя сродкі, полівітаміны, некаторыя амінакіслоты, фізія- і іголкараэфлексатэрапію.

*Г.Г.Шанько.*

Віды **аблогавай тэхнікі**: *1* — шчыт; *2* — вінея; *3* — рухомая вежа; *4* — рухомыя і падвешвальныя на круках драбіны; *5* — крук-разбуральнік; *6* — штурмавыя драбіны (самбук); *7* — таран.



**Абломы архітэктурныя**: *1* — палічка; *2* — вал; *3* — «ястрабіная дзюба»; *4* — кіматый (*а* — прамы, *б* — адваротны); *5* — абцасік (*а* — прамы, *б* — адваротны); *6* — выкружка; *7* — астрагал; *8* — скоцыя.

**АБЛЯПІ́ХА** (Hippophae), род кустовых і дрэвавых раслін сям. лохавых. Вядомы 3 віды, пашыраныя ў Еўразіі. На Беларусі ў канцы 19 ст. інтрадукавана А. крушынападобная (H. rhamnoides), звычайная ў аматарскіх насаджэннях.

Калючыя кусты або разгалінаваныя дрэўцы, часта са скрыўленым ствалом, выш. 0,1—7, зрэдку да 15 м. Кветкі паяўляюцца разам з лісцем, дробныя, аднаполыя. Расліна

**Абляпіха** крушынападобная: *1* — парасткі жаночай расліны (*а* — з суквеццямі, *б* — з пладамі); *2* — парасткі мужчынскай расліны (*а* — з суквеццямі, *б* — прырост бягучага года).

двухдомная (мужчынская і жан.), таму для плоданашэння патрэбна мець у суседстве разнаполыя асобіны. Плод — несапраўдная касцянка шарападобна-авальнай формы, залаціста-жоўты або аранжавы ў жн.—верасні. Размнажэнне насеннем або вегетатыўнае. У пладах шмат вітамінаў, алей. Дэкар. расліны, як лек. сродак выкарыстоўваюць *абляпіхавы алей*.

**АБЛЯПІ́ХАВЫ АЛЕ́Й**, алей з пладоў *абляпіхі*. Вадкасць ад светла-жоўтага да аранжава-карычневага колеру, t застывання -20 °С, шчыльн. $0{,}92 \cdot 10^3$ кг/м$^3$, нерастваральны ў вадзе, растваральны ў арган. растваральніках. Мае ў сабе 11—12% насычаных тлустых кіслот ($C_{16}$, $C_{18}$), 23—42% алеінавай, 32—36% ліноленавай, 14—27% ліналенавай кіслот, багаты каратынамі, каратыноідамі, вітамінам Е. Антысептык, выкарыстоўваюць пры апёках, пашкоджаннях скуры, язвавых і інш. захворваннях.

**АБЛЯ́ЦЫЯ** (ад лац. ablatio адніманне), 1) у г л я ц ы я л о г і і — памяншэнне масы лёду і фірну ледавікоў у выніку раставання, выпарэння ці мех. выдалення (знос снегу ветрам, утварэнне айсбергаў і г.д.). Адрозніваюць падледавіковую (донную), унутраную і паверхневую А. Асн. фактары: кліматычныя, унутранае цяпло Зямлі, цёплыя крыніцы, цеплыня ад трэння ледавіка аб ложа ці састаўныя яго часткі і інш. На Беларусі А. адбывалася ў антрапагенавым перыядзе на працягу *зледзянення*. 2) У т э х н і ц ы — вынас рэчываў з паверхні цвёрдага цела патокам газу. З'яўляецца вынікам фіз.-хім. працэсаў, што адбываюцца ў цвёрдым целе пад дзеяннем аплаўлення, выпарэння, раскладання і хім. эрозіі металаў. На А. заснавана абляцыйнае ахаладжэнне (цеплавая ахова) касм. лятальных апаратаў, частак ракет-носьбітаў, ракетных рухавікоў і інш., якія падвяргаюцца аэрадынамічнаму награванню пры ўваходзе ў атмасферу.

**АБМАРАЖЭ́ННЕ**, пашкоджанне тканак арганізма ўздзеяннем нізкіх тэмператур. А. садзейнічаюць высокая вільготнасць халоднага паветра, слабая супрацiўляльнасць арганізма, цесныя абутак і адзенне.

Адрозніваюць 4 ступені А.: 1-я — сінюшная ацёчная скура, боль і сверб; 2-я — пашкоджанне паверхневага слоя скуры, вадзяныя пухіры; 3-я амярцвенне скуры і падскурнай клятчаткі, крывяністыя пухіры; 4-я — амярцвенне мяккіх тканак і касцей. Лячэнне: 1-я і 2-я ступені — саграванне (вадзяныя ванны з т-рай 18—20 °С, потым 35—40 °С з адначасовым масажам; фізіятэрапія — сухое цяпло, кварцавае апрамяненне); 3-я і 4-я ступені — хірургічнае. Прафілактыка: загартоўванне арганізма, зручнае адзенне і абутак, своечасовая дапамога пры першых прыкметах А.

**АБМЕЖАВА́ЛЬНЫЯ ЗАКО́НЫ** п а з е м л е ў л а д а н н і і з е м л е к а р ы с т а н н і, сукупнасць расійскіх нарматыўных актаў па абмежаванні маёмасных правоў насельніцтва Беларусі, Літвы і Правабярэжнай Украіны ў канцы 18 — пач. 20 ст. ў сферы землеўладання і землекарыстання. Пасля далучэння гэтых тэрыторый да Рас. імперыі канфіскоўваліся маёнткі памешчыкаў, якія адмовіліся прысягаць расійскім імператарам, землі ўдзельнікаў паўстання 1794, 1830—31, 1863—64 падлягалі і секвестру (у гэтым выпадку ўладальнік павінен быў прадаць зямлю або абмяняць яе на маёнтак ва ўнутраных раёнах Расіі). У 1864—65 набываць зямлю (за выключэннем пераходу па спадчыне) і ўступаць у землекарыстанне было забаронена «асобам польскага паходжання» і яўрэям. У 1860—1-й пал. 1870-х г. канфіскаваны або секвестраваны сотні зямельных участкаў вакалічнай шляхты. У 1882 у сельскай мясцовасці мяжы аселасці яўрэям забаронена арандаваць, браць у заклад ці кіраванне зямельную маёмасць усіх відаў. У 1884 аналагічны закон прыняты да «асоб польскага паходжання». З 1887 на Беларусі (апрача Магілёўскай губ.) права куплі зямлі пазбаўлены іншаземцы. У канцы 1860-х—80-я г. пэўныя абмежаванні ўведзены і для сялян (напр., яны маглі купляць канфіскаваныя або секвестраваныя маёнткі толькі цалкам). У выніку А.з. плошча зямель мясц. памешчыкаў на Беларусі паменшылася з 7,5 млн. дзес. (78,4%) да 4,1 млн. дзес. (42,4%). Пад уплывам рэв. руху ў пач. 20 ст. шэраг А.з. скасаваны, астатнія праіснавалі да 1917.

*Літ.*: Громачевский С.Г. Ограничительные законы по землевладению в Западном крае с мотивами и разъяснениями. Спб., 1892; Жукович П.И. О русском землевладении в Северо-Западном крае со времени присоединения его к России. Спб., 1895.

*В.П.Панюціч.*

**АБМЕЖАВА́НАЯ АДКА́ЗНАСЦЬ**, 1) абмежаванне выплат страхавой кампенсацыі і страхавых сум з мэтай забеспячэння фін. устойлівасці страхавых аперацый; прадугледжана ўмовамі асобных відаў страхавання і, як правіла, закладзена ў тарыфах. 2) Абмежаванне кампенсацыі страт ад гасп. дзейнасці сумай укладзенага капіталу ў *таварыствах з абмежаванай адказнасцю*.

**АБМЕ́Н** у э к а н о м і ц ы, узаемны абмен дзейнасцю (таварамі, паслугамі) паміж людзьмі, як правіла, на эквівалентнай аснове. Адбываецца непасрэдна ў вытв-сці (А. вытв. дзейнасцю або загатоўкамі, паўфабрыкатамі) і ў форме А. прадуктамі працы і паслугамі. З аднаго боку, А. — састаўная ч. вытв. працэсу, з другога — адна з самаст. стадый грамадскага ўзнаўлення, якая спалучае вытв-сць з размеркаваннем і спажываннем.

Неабходнасць А. абумоўлена грамадскім падзелам працы. У першабытным грамадстве звязаны з падзелам працы ўнутры абшчыны (А. паміж абшчынамі быў выпадковы). З развіццём вытв-сці А. набываў рэгулярны характар і асабліва пашырыўся з усталяваннем машыннай індустрыі. Са з'яўленнем грошай непасрэдны А. тавараў (Т—Т) перарос у *абарачэнне*, але захаваўся ў вытв-сці, а таксама ў бартэрных здзелках (гл. *Бартэр*).

**АБМЕ́Н РЭ́ЧЫВАЎ**, м е т а б а л і з м, сукупнасць хім. ператварэнняў рэчываў у жывых арганізмах, якія забяспечваюць іх развіццё, жыццядзейнасць, самаўзнаўленне, сувязь з навакольным

Схема абмену рэчываў.

Да арт. **Абмундзіраванне вайсковае.** I. Адзенне воінаў 11—14 ст.: *1—2* — воіны Старажытнай Русі (11—12 ст.); *3* — літоўскі воін 14 ст.; *4—7* — военачальнікі Вялікага княства Літоўскага. II. Ваяводскія і павятовыя мундзіры беларускай шляхты (1780): *1* — Смаленскае ваяв.; *2* — Гарадзенскі пав.; *3* — Ашмянскі пав.; *4* — Віленскае ваяв.; *5* — Наваградскае ваяв.; *6* — Аршанскі пав.; *7* — Полацкае ваяв.; *8* — Берасцейскае ваяв. III. Адзенне войска Вялікага княства Літоўскага (1776—94): *1* — генерал-маёр; *2* — афіцэр 3-га палка пяродняй стражы; *3* — ротмістр яничарскай харугвы Булавы вялікай; *4* — шараговы пешай гвардыі; *5* — шараговы коннай гвардыі; *6* — бамбардзір корпуса артылерыі; *7* — інжынер ваеннага корпуса інжынераў.

Да арт. **Абмундзіраванне вайсковае.** Форма адзення ваеннаслужачых Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. Для генералаў: *1* — летняя парадна-выхадная, *2* — летняя штодзённая (акрамя авіяцыі), *3* — летняя штодзённая (авіяцыі), *4* — зімовая штодзённая, *5* — летняя штодзённая (з кашуляй), *6* — летняя палявая; для афіцэраў і прапаршчыкаў: *7* — летняя парадна-выхадная, *8* — летняя штодзённая (акрамя авіяцыі), *9* — летняя штодзённая (авіяцыі), *10* — летняя штодзённая (з курткай і пілоткай), *11* — зімовая штодзённая (з фуражкай), *12* — летняя штодзённая (з плашч-паліто), *13* — летняя штодзённая (з кашуляй), *14* — летняя палявая, *15* — зімовая палявая; для салдат, сяржантаў і курсантаў ваенных вучылішчаў: *16* — летняя парадна-выхадная, *17* — летняя палявая, *18* — зімовая палявая; для салдат і сяржантаў паветрана-дэсантных войскаў: *19* — летняя палявая; для ваеннаслужачых жанчын: *20* — летняя штодзённая (з курткай і пілоткай), *21* — летняя палявая.

асяроддзем і адаптацыю да змен у ім. Аснову А.р. складаюць непарыўна звязаныя і ўзаемаабумоўленыя працэсы *анабалізму, катабалізму* і *абмену энергіі*. У сукупнасці яны забяспечваюць структурную і функцыян. цэласнасць арганізмаў, ляжаць у аснове іх *гамеастазу*. У планетарным маштабе А.р. складае важную частку *кругавароту рэчываў* у прыродзе. Для кожнага віду жывых арганізмаў характэрны свой, генетычна замацаваны ўзровень А.р., які залежыць ад іх спадчынных уласцівасцяў, месца ў эвалюцыйным радзе, узросту, полу, умоў існавання і інш. фактараў (напр., А.р. ніжэйшы ў раслін і халаднакроўных жывёл, вышэйшы ў цеплакроўных, слабы ў час спячкі, анабіёзу, высокі ў перыяд размнажэння і г.д.). Пры вял. і разнастайным асартыменце арган. рэчываў, якія ўцягваюцца ў абмен, агульная яго схема ў розных арганізмаў падобная, вызначаецца ўпарадкаванасцю і падабенствам паслядоўнасці біяхім. ператварэнняў, што адбываюцца пры абавязковым удзеле *ферментаў*. Дзякуючы А.р. з пажыўных рэчываў утвараюцца характэрныя для дадзенага арганізма злучэнні, якія выкарыстоўваюцца як буд. ці энергет. матэрыял, пастаянна і няспынна абнаўляюцца органы і тканкі без прынцыповай змены іх хім. саставу. Асн. тыпы злучэнняў, якія ўдзельнічаюць у А.р. у арганізме, — бялкі, тлушчы, вугляводы, мінеральныя рэчывы. Іх навук. даследаванне вылучаецца ў самаст. раздзелы біяхіміі.

Ператварэнні рэчываў ад моманту іх паступлення ў арганізм да ўтварэння канчатковых прадуктаў распаду складаюць сутнасць т. зв. прамежкавага А.р. Асн. яго этапы: пераўтварэнне і ўсмоктванне пажыўных рэчываў у страўнікава-кішачным тракце; дастаўка атрыманых рэчываў да розных органаў і тканак; іх перабудова, раскладанне і выкарыстанне для біясінтэзу спецыфічных рэчываў, клетак і тканак; раскладанне такіх рэчываў з утварэннем прамежкавых злучэнняў і канчатковых прадуктаў абмену; выдаленне апошніх з арганізма. Цэнтр. месца ў А.р. належыць цыклу трыкарбонавых кіслот, у якім перакрыжоўваюцца шляхі бялковага, вугляводнага, тлушчавага абмену (гл. схему). Найважн. прамежкавы прадукт А.р. — ацэтылкаэнзім А, які ўдзельнічае ва ўсіх працэсах анабалізму і катабалізму і аб'ядноўвае іх; асн. канчатковыя прадукты — $H_2O$, $CO_2$, $NH_3$, мачавіна і інш. У рэгуляванні працэсаў А.р. гал. месца займаюць змены актыўнасці і інтэнсіўнасці сінтэзу клетак, абмен можа самарэгуляваца па прынцыпе адваротнай сувязі. Вял. значэнне ў рэгуляванні А.р. маюць біял. мембраны. У высокаарганізаваных жывёл рэгулюецца і каардынуецца *нейрагумаральнай сістэмай* пры ўдзеле біял. актыўных рэчываў (вітаміны, гармоны, медыятары і інш.). Разбалансаванне А.р. з'яўляецца прычынай або вынікам узнікнення разнастайных хвароб, фіксацыя змен у ім — важны дыягнастычны сродак. Гл. таксама *Бялковы абмен, Вугляводны абмен, Тлушчавы абмен, Мінеральны абмен*.

*Літ.*: Ленинджер А. Основы биохимии: Пер. с англ. Т. 1—3. М., 1985; Страйер Л. Биохимия: Пер. с англ. Т. 1—3. М., 1984—85. *Я.В.Малашэвіч.*

**АБМЕ́Н ЭНЕ́РГІІ**, энергетычны абмен, сукупнасць працэсаў утварэння, назапашвання, трансфармацыі і выкарыстання энергіі ў жывых арганізмах, а таксама працэсаў абмену паміж імі і навакольным асяроддзем. А.э. неадрыўны ад *абмену рэчываў*, карэліруе з яго ўзроўнем, мае фундаментальнае значэнне ў жыцці ўсіх арганізмаў. У аснове ўнутрыклетачнага А.э. ляжыць *акісленне біялагічнае* арган. злучэнняў з назапашваннем і ператварэннем т. зв. *макраэргічных сувязяў* АТФ, крэацінфасфату, фосфаэнолпіравату, 3-фосфагліцэрату і інш. макраэргаў (гал. ролю пры гэтым выконвае цыкл трыкарбонавых кіслот). Выходнымі вонкавымі крыніцамі для забеспячэння іх энергет. патрэб з'яўляецца энергія пажыўных і інш. рэчываў, што засвойваюцца арганізмам, і светлавая энергія, якая ўключаецца ў біяэнергет. абмен праз фотасінтэз. Ён забяспечвае існаванне не толькі раслін, але і ўсіх гетэратрофных арганізмаў. Гал. крыніцы энергіі ўнутры арганізма — вугляводы (даюць больш за 50% энергіі) і тлушчы. Праз ператварэнні рэчываў у арганізме ажыццяўляецца трансфармацыя хім. энергіі ў інш. віды — мех., цеплавую і інш. *Я.В.Малашэвіч.*

**АБМЕ́ННАЕ ЎЗАЕМАДЗЕ́ЯННЕ**, спецыфічны ўзаемны ўплыў тоесных часціц, які эфектыўна праяўляецца як вынік некаторага асабліваго ўзаемадзеяння. Чыста квантавы эфект, які не мае класічнага аналага і вынікае з *тоеснасці прынцыпу*.

Пры сілавым узаемадзеянні паміж часціцамі сярэдняя энергія сістэмы часціц неаднолькавая ў станах, што апісваюцца *хвалевымі функцыямі* з рознай сіметрыяй, напр. сістэма з 2 электронаў, калі не ўлічваць іх эл. ўзаемадзеяння, характарызуецца 2 хвалевымі функцыямі $\varphi(r_1, r_2)$, якія адносна перастаноўкі каардынат электронаў ($r_1 \rightleftarrows r_2$) мяняюць або не мяняюць знак. Станам з $\varphi\pm$ адпавядае сярэдняя энергія ўзаемадзеяння $E_\pm = E_k + E_a$, дзе $E_k$ — энергія электрастатычнага (кулонаўскага) узаемадзеяння электронаў, кожны з якіх знаходзіцца ў індывід. стане; $E_a$ — т.зв. абменная энергія, што ўзнікае, калі электроны як бы абменьваюцца сваімі станамі (адсюль назва). А.ў. існуе ў сістэме тоесных часціц і пры адсутнасці сілавога ўзаемадзеяння (ідэальны газ тоесных часціц). Яно пачынае праяўляцца, калі сярэдняя адлегласць паміж часціцамі становіцца параўнальнай з даўжынёй *хвалі дэ Бройля*, мае характар адштурхоўвання для *ферміёнаў* (гл. *Паўлі прынцып*) і прыцяжэння— для *базонаў*. Паняццем А.ў. карыстаюцца ў тэорыі многаэлектронных атамаў, гомеапалярнай хім. сувязі, феромагнетызму. Тэрмін А.ў. ўжываецца і ў ядз. фізіцы (гл. *Ядзерныя сілы*). *Л.М.Тамільчык.*

**АБМУНДЗІРАВА́ННЕ ВАЙСКО́ВАЕ**, форменнае адзенне ваеннаслужачага, адметнае колерам, канструкцыяй (кроем), *знакамі адрознення* і інш.

Элементы А.в. вядомыя са стараж. часоў (Егіпет, Асірыя, Персія, Грэцыя), больш выразнымі сталі ў арміі Стараж. Рыма. Упершыню аднолькавае А.в. па відах і родах войскаў уведзена ў Францыі ў 17 ст. На Беларусі А.в. пачало набываць адметнасць з часоў сярэдняявечча і пазней. Напр., у 2-й пал. 18 ст. шараговы першай гвардыі ВКЛ насіў чырв. мундзір з сінімі вылогамі (адваротамі) і суконнымі пагонамі. Бікорн (галаўны ўбор) упрыгожваў пампон жоўтага колеру. На штанах сіняга колеру — адмысловая аздоба, характэрная толькі для палка пешай гвардыі. Бамбардзір (камандзір гарматнага разліку) у корпусе артылерыі ВКЛ, напр., меў мундзір з чорным каўняром, адваротамі і манжэтамі, зялёныя суконныя штаны з чорнымі лампасамі, на касцы змяшчалася латунная эмблема ў выглядзе палаючай гранаты, вызва якой была таксама на торбе для нашэння набояў (боезапасаў). Шараговы коннай гвардыі ВКЛ меў чырв. мундзір без лацканаў і белыя лясіны (штаны са скуры лася, якія шчыльна аблягалі ногі) з батфортамі, насіў парык. Верхні край бікорна быў абшыты галуном. А.в. з цягам часу мянялася.

Ва Узбр. Сілах Рэспублікі Беларусь нац. форма А.в. распрацавана і зацверджана ў 1993. У яго ўваходзяць: верхняе адзенне (паліто і куртка зімовыя, плашч-паліто, кіцель, куртка, штаны, кашуля і інш.), галаўныя ўборы (шапка-вушанка, фуражка, пілотка), бялізна, абутак, амуніцыя. Парадак выкарыстання А.в. вызначаецца правіламі нашэння вайск. формы адзення, якая падзяляецца на парадную, парадна-выхадную, паўсядзённую, палявую і рабочую, а кожная з іх — на летнюю і зімовую. Права нашэння А.в. маюць ваеннаслужачыя ўзбр. сіл, ваен.-навуч. устаноў, а таксама тыя катэгорыі ваеннаслужачых, за якімі пасля звальнення ў запас ці адстаўку захавана такое права. *У.П.Рудэнка, В.А.Юшкевіч.*

**АБНАРО́ДАВАННЕ ЗАКО́НУ**, давядзенне закону да ўсеагульнага ведама; афіцыйнае апублікаванне закону. Ажыццяўляецца органам, які прыняў закон, або кіраўніком дзяржавы ў вызначаныя дадзеным ці спец. законам тэрміны і ўстаноўленым парадку. У Рэспубліцы Беларусь законы і інш. акты, прынятыя Вярх. Саветам, публікуюцца ў «Ведамасцях Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь», перадаюцца праз сродкі масавай інфармацыі (газеты, тэлебачанне, радыё), сродкі сувязі. *А.М.Абрамовіч.*

**АБНАЎЛЕ́НЦЫ**, апазіцыйны рух у рус. правасл. царкве ў 1920—40-я г. Узніклі пасля Кастр. рэвалюцыі. Выступалі за «абнаўленне царквы», за яе лаяльныя адносіны да Сав. дзяржавы; мелі на мэце змяніць традыц. формы рэліг. дзейнасці, не закранаючы асновы веравучэння і культу. Змагаліся супраць кіраўніцтва афіц. рус. царквы, якое ў пач. 1920-х г. займала антысав. пазіцыі.

Асн. групы А.: «Жывая царква», «Царкоўнае адраджэнне», «Саюз абшчын старажытнапастальскай царквы». З пераходам кіраўніцтва патрыяршай царквы на шлях лаяльнасці рух А. пачаў затухаць. Многія з іх парвалі з рэлігіяй, некаторыя вярнуліся ў старую царкву. Пасля смерці аднаго з лідэраў абнаўленства А.І.Увядзенскага (1946) рух спыніўся.

**АБО́ЗНЫ**, 1) пасада ў войску ВКЛ і Рэчы Паспалітай у 16—18 ст. Прызначаўся гетманам, з 1776 — каралём. Займаўся раскватараваннем войскаў: выба-

рам месца пад лагер, яго ўмацаваннем. Галоўных А. было 2 — каронны (польскі) і літоўскі. 2) Выбарная вайск. пасада на Украіне ў 17—18 ст. Генеральныя А. арганізоўвалі гетманскае войска, забяспечвалі яго харчаваннем і фуражом, кіравалі артылерыяй, удзельнічалі ў перагаворах, расследавалі злачынствы, палкавыя былі нам. казацкіх палкоўнікаў, узначальвалі палкавую артылерыю. 3) Ніжэйшы чын пры ваен. гужавым транспарце і абозах у дарэв. Расіі і інш. краінах.

**АБО́ЙМА**, 1) прыстасаванне для размяшчэння некалькіх патронаў. Прызначана для больш спрошчанага і паскоранага зараджання (падрыхтоўкі магазінаў стралк. зброі — вінтовак, карабінаў, аўтаматаў, некаторых пісталетаў, кулямётаў і малакаліберных гармат). А. —метал. рамка, якая ўстаўляецца ў магазінную каробку агнястрэльнай зброі. У некаторых відаў зброі выкарыстоўваецца як дэталь, што ўтрымлівае і накіроўвае патроны пры іх дасылцы з магазіна ў патроннік. 2) Дэталь, прыстасаванне ў выглядзе скабы, абруча з паласавога жалеза, якія служаць для змацавання частак машын, збудаванняў і інш.

**АБО́Л** (грэч. obolos), 1) у Стараж. Грэцыі вагавая адзінка серабра, сярэбраная, потым медная манета (складала $\frac{1}{6}$ драхмы). 2) У Зах. Еўропе ў 2-й пал. 8—10 ст. вагавая адзінка серабра і сярэбраная манета ( $\frac{1}{2}$ *дэнарыя*), у 12—15 ст. сярэбраная, у 16—18 ст. білонная або медная манета ( $\frac{1}{2}$ дэнарыя). 3) У ВКЛ намінал у $\frac{1}{2}$ дэнарыя, чаканены *Віленскім манетным дваром* у 1545—47, 1554.

**АБО́ЛЕ**, возера ў Беларусі, у Браслаўскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Дрысвята. Пл. 4,67 км². Даўж. 6,55 км, найб. шыр. 1,43 км, найб. глыб. 9,2 м. Пл. вадазбору каля 750 км². Праз возера цячэ р. Дрысвята (у вытоку наз. Прорва). Берагі выш. 0,3—0,5 м, пясчаныя, месцамі забалочаныя, параслі хмызняком.

Схілы выш. да 15 м, стромкія. Паўночны плёс невялікі, мелкаводны, паўднёвы—глыбокі. Дно да глыб. 1 м пясчанае, глыбей глеістае. 2 астравы агульнай пл. 1,6 га. Уздоўж берагоў паласа расліннасці шыр. 30—600 м.

**АБО́ЛЬЦЫ**, вёска ў Беларусі, у Талачынскім р-не Віцебскай вобл., на р. Абалянка. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Дзяржынскага. За 36 км на Пн ад г. Талачын, 116 км ад Віцебска, 9 км ад чыг. ст. Лемніца. 450 ж., 156 двароў (1994).

У гіст. крыніцах упершыню ўпамінаецца ў 1385 як маёмасць вял. кн. ВКЛ Ягайлы. Пад назвай «Оболчи» згадваецца ў «Спісе рускіх гарадоў далёкіх і блізкіх» (14 ст.). У 15 — пач. 16 ст. цэнтр Аболецкага намесніцтва (павета) Віцебскай зямлі. Пасля адм. рэформы ВКЛ 1565—66 уключаны ў Аршанскі пав. На 1885 у А. 265 ж., 60 дамоў. У 1924—31, 1946—56 А. — цэнтр сельсавета Коханаўскага, у 1931—46 і з 1956 — Талачынскага р-нау.

Сярэдняя школа, б-ка, Дом культуры, бальніца, аптэка, дзіцячы сад, аддз. сувязі, камбінат быт. абслугоўвання.

**АБО́РА**, 1) традыцыйная гаспадарчая пабудова на Беларусі для кароў. У 16—пач. 20 ст. будавалі з бярвення ці дыляў («у вянок», «замётам у шулы»), часам сцены плялі з лазовых дубцоў і абмазвалі глінай. У сял. гаспадарках А. — вял. *хлеў*. У фальварках і маёнтках А. будавалі звычайна на 4—8 памяшканняў (кожнае мела асобныя вароты), згрупаваных прамавугольнікам вакол двара і звязаных адно з адным у суцэльную забудову. Такі комплекс часта злучаўся варотамі з падвор'ем, гумнішчам.



Абоймы: *1* — да вінтоўкі ўзору 1891/30; *2* — да самазараднага карабіна Сіманава; *3* — да вінтоўкі з пачкавым набіваннем; *4* — да аўтаматычнай пушкі.



Сярэбраны абол 1546 Жыгімонта II Аўгуста (ВКЛ).



Абора.

У А. вылучаліся памяшканні для цельных кароў, маладняку, маглі ўваходзіць таксама птушнікі, стайні, жылыя і гасп. будынкі для парабкоў. 2) Загароджаная частка двара для дзённага ўтрымання хатняй жывёлы (дзяннік). 3) Загон для жывёлы на выпасах. 4) Вяровачка з пянькі, лёну ці рамешны пасак для прымацоўвання лапця і анучы.

**АБО́РТ** (лац. abortus), спыненне цяжарнасці ў жанчын у першыя 22 тыдні (раней лічылі 28), калі плод яшчэ не здольны да жыцця па-за целам маці. Спыненне цяжарнасці ў больш позніх тэрміны (да 38 тыдняў) наз. заўчаснымі родамі. А. да 12 тыдняў лічыцца ранні, пасля гэтага тэрміну — позні. А. штучны — спыненне цяжарнасці пры дапамозе спец. інструментаў або фармакалагічных сродкаў урачом у мед. установе; дазволены заканадаўствам у большасці краін свету, у т.л. ў Рэспубліцы Беларусь. Штучнае спыненне цяжарнасці па-за бальнічнай установай або без урача лічыцца крымінальным. Самаадвольны А. (выкідыш) можа быць вынікам уздзеяння генет., эндакрынных, інфекц., сац.-эканам., экалаг., прафес. фактараў і звязаных з гэтым хвароб жанчыны і мужчыны і стварае вял. праблему ў акушэрстве — да 15—20% выкідышаў. У самаадвольным А. адрозніваюць стадыі: пагражальны А., А., які пачаўся, А. няпоўны і поўны. На 2 першых стадыях магчыма захаванне цяжарнасці. Самаадвольны А. можа ўзнікаць паўторна (прывычны выкідыш), асн. сімптомы: болі ў нізе жывата і ў крыжы, крывяныя выдзяленні, далучаная інфекцыя. А., якому спадарожнічае інфекцыя, наз. інфекцыйны. Любы А. можа выклікаць ускладненні раннія (крывацёкі, пракол сценкі маткі, пашкоджанні сумежных органаў) і познія (запаленне палавых органаў і брушыны, бясплоднасць, эндакрынныя парушэнні), а таксама смерць жанчыны. Лячэнне А. на ўсіх стадыях праводзіцца ў стацыянарных умовах.

*І.У.Дуда.*

**АБО́РЫН** Леў Мікалаевіч (11.9.1907, Масква — 5.1.1974), рускі піяніст, педагог. Нар. арт. СССР (1964). Скончыў Маскоўскую кансерваторыю (1926, клас К.Ігумнава), з 1930 выкладаў у ёй (з 1935 праф.). Выступаў як саліст і ансамбліст (з Д.Ойстрахам і С.Кнушавіцкім). 1-я прэмія на Міжнар. конкурсе піяністаў імя Ф.Шапэна (Варшава, 1927). Дзярж. прэмія СССР 1943, Дзярж. прэмія Расіі 1966.

*Літ.*: Л.Н.Оборин: Статьи. Воспоминания: К семидесятилетию со дня рождения. М., 1977; Л.Н.Оборин — педагог: [Сб. ст.]. М., 1989.

**АБПА́Л**, тэрмічная апрацоўка матэрыялаў з мэтай надання ім неабходных уласцівасцяў ці для ачышчэння ад дамешкаў. Уключае награванне да пэўнай т-ры, вытрымку і ахаладжэнне да пакаёвай т-ры. Суправаджаецца рэакцыямі раскладання(пры апрацоўцы прыроднай сыравіны), акіслення або аднаўлення (пры выгаранні дамешкаў, узаемадзеянні з вугляродам, вадародам ці кіслародам), мінералаўтварэння; фазавымі пераўтварэннямі (частковае

плаўленне матэрыялаў, выпарэнне і інш.). Робіцца ў *абпальвальных печах* у акісляльна-аднаўляльным або нейтральным газавым і цвёрдым асяроддзях, а таксама ў вакууме. Руды і рудныя канцэнтраты абпальваюць перад іх абагачэннем, кавалкаваннем, плаўкай для змены іх фіз. і хім. уласцівасцяў. Сыравіну для буд., вяжучых матэрыялаў (гліна, вапняк, цэментная шыхта), вогнетрывалую цэглу, фарфоравыя і фаянсавыя паўфабрыкаты абпальваюць для атрымання вырабаў пэўнай формы і памераў з неабходнымі ўласцівасцямі, эмалі і фарбы — для нанясення пакрыццяў з ахоўнымі і мастацка-дэкаратыўнымі мэтамі.

**АБПА́ЛЬВАЛЬНАЯ ПЕЧ**, печ для *абпалу* розных матэрыялаў. А.п. з т-рай рабочай зоны 700—1300 °С паводле канструкцыі бываюць шахтавыя, шматподавыя, трубчастыя, вярчальныя. Прызначаныя для абпалу вогнетрывалай гліны, вапняку, даламіту, цэментнай шыхты, метал. рудаў. Камерныя, кальцавыя, тунэльныя, канвеерныя А.п. з т-рай вышэй за 1000 °С выкарыстоўваюцца для абпалу вогнетрывалай цэглы, фарфоравых і фаянсавых вырабаў, эмаляў і фарбаў на посудзе, дэталях машын і апаратаў.

**А́БРА** (Abra), марскі малюск, гл. *Сіндэсмія*.

**АБРАГА́ЦЫЯ** (лац. abrogatio), адмена або змена ўстарэлага закону з прычыны яго бескарыснасці або супярэчлівасці духу і норавам часу. Абвяшчаецца ўвядзеннем новага закону.

**АБРА́Д**, комплекс строга вызначаных чыннасцяў, слоўных формул, жэстаў, абумоўленых пэўнымі рэліг. вераваннямі. А. абслугоўваюць рэліг. культы, звязаныя з імі грамадска-прававыя акты і працоўныя працэсы. Мэта А. — забеспячэнне магічным чынам спрыяльнага развіцця прыродных з'яў, плёну ў працы, дабрабыту, здароўя, працягласці роду і інш.

Структура А. бывае даволі складаная: яна мае «ядро» — асн. чыннасці — і шэраг свабодных, імправізацыйных дзеянняў, за кошт якіх фарміруюцца лакальныя або часавыя варыянты. Этнічныя варыянты блізкіх А. найб. цікавыя і інфарматыўныя. Як правіла, найб. важныя нар. А. паходзяць з вельмі даўніх часоў. Яны фарміраваліся на архаічнай ідэалаг. аснове і з'яўляюцца рэалізацыяй глыбока закаранёных у нар. свядомасці ўяўленняў пра навакольны свет, жыццё прыроды і чалавека, адносіны чалавека з космасам і да т.п.

Бел. нар. А. падзяляюцца на к а л я н д а р н ы я, звязаныя з урачыстасцямі паваротных пунктаў гадавога сонечнага цыкла, і с я м е й н ы я, якія сакралізуюць змены ў грамадскім статусе чалавека, прымеркаваныя да асн. момантаў яго жыцця: нараджэнне (гл. *Радзіны*), наданне імя, уступленне ў шлюб (гл. *Вяселле*), пахаванне. Сямейныя А. былі ў пэўнай залежнасці ад каляндарных (напр., вяселлі дазвалялася ладзіць толькі ў непаставыя тыдні). Багатая абраднасць беларусаў сведчыць пра складанае ўзаемадзеянне нар. язычніцкай абраднасці з абраднасцю хрысціянскай (гл. *Абрады рэлігійныя*). Язычніцкая аснова А. у большасці засталася непарушная, хрысціянства наклалася на гэту сістэму тонкім пластом (наданне пэўным святам імёнаў святых, прымеркаванне сваіх міфаў, сімволікі і інш.). Так, да стараж. навагодняга свята *Вялікадня* далучана Пасха і паданні пра замардаванне і дзівоснае ўваскрэсенне Ісуса Хрыста, дзень Вялеса (Масленка) стаў запустамі, дзень Ярылы-*Юр'я* — днём св. Георгія, зялёныя святкі — Тройцай (гл. *Сёмуха*), *Купалле* — днём св. Яна і да т.п. Аднак многія А. засталіся чыста язычніцкія, без далучэння хрысціянскай міфалогіі: пахаванне «стралы» ў Пасожжы, «куст» на Піншчыне, «жаніцьба Цярэшкі» на Полаччыне, «жаніцьба коміна» на Палессі і інш. Гэтыя А. складаюць адметнасць бел. абрадавай творчасці. З гадавымі

Да арт. **Абрадавае печыва.** Вясельны каравай.

ўрачыстасцямі звязваецца шмат А., абумоўленых логікай святкавання, станам прыроды, прац. задачамі. Асн. з іх: памінанне продкаў (*Дзяды*, *Радаўніца*), *абходы* дваро ў з віншавальна-велічальнымі песнямі, драм. сцэнкамі, танцамі, музыкай, *варажба*, магічныя засцерагальныя дзеянні, абрадавыя гульні, ачышчэнне вадой і агнём, ахвяраванні і калектыўныя бяседы. Кожны значны А. уключае асобныя элементныя А. Так, вясельны комплекс уключае А. «віццё вянка», «вянок» (дзявочы вечар; гл. *Суборная субота*), каравайны А. (гл. *Каравай*), благаславенне або *пасад*, царкоўны шлюб, праводзіны і сустрэчу маладых (прылучэнне да роду), дарэнне і інш.; А. дажынак (гл. *Дажынкі*) — віццё вянка гаспадару, дзеянні з апошнім снапом, гуканне Спарыні. Даволі складаны комплекс А. суправаджаў першы выган жывёлы ў поле, заворванне нівы, засеўкі і інш.

Многія бел. А. маюць аналагі ў абрадавай практыцы ант. народаў. Найб. уражлівы прыклад, занатаваны ў пач. 20 ст., — абрадавы дыялог, прысвечаны хлебу. Святар, хаваючыся за вялізным мядовым пірагом на свята ўраджаю, пытаўся ў прысутных, ці бачаць яны яго, і жадаў, каб налета зусім не бачылі. Гэты А., які быў у язычніцкім храме ў Арконе (на в-ве Руген), апісаны дацкім храністам 12 ст. Саксонам Граматыкам. Гл. таксама *Абрадавае печыва*, *Абрадавыя стравы*.

*Літ.*: З а н к е в и ч А. Белорусские свадебные обряды и песни сравнительно с великорусскими. Спб., 1897; А н и ч к о в Е. Весенняя обрядовая поэзия на Западе и у славян. Ч. 1—2. Спб., 1903—05; Радзінная паэзія. Мн., 1971; К р у т ь Ю.З. Хліборобська обрядова поезія слов'ян. Київ, 1973; Песні народных свят і абрадаў. Мн., 1974; Л і с А.С. Купальскія песні. Мн., 1974; Я г о ж. Валачобныя песні. Мн., 1989; Я г о ж. Жніўныя песні. Мн., 1993; Зімовыя песні. Мн., 1975; Календарные обычаи и обряды в странах зарубежной Европы: Зимние праздники. М., 1973; Календарные обычаи и обряды в странах зарубежной Европы: Конец XIX — начало XX в.: Весенние праздники. М., 1977; Календарные обычаи и обряды в странах зарубежной Европы: Летне-осенние праздники. М., 1978; Календарные обычаи и обряды в странах зарубежной Европы: Ист. корни и развитие обычаев. М., 1983; К у р о ч к і н О.В. Новорічні свята українців. Київ, 1978; Вяселле: Абрад. Мн., 1978; С о к о л о в а В.К. Весенне-летние календарные обряды русских, украинцев и белорусов, XIX — начало XX в. М., 1979; Г у р с к и й А.И. Зимняя поэзия белорусов. Мн., 1980; М а ж э й к а З.Я. Песні беларускага Паазер'я. Мн., 1981; Народны тэатр. Мн., 1983; Палескае вяселле. Мн., 1984; М а с л о в а Г.С. Народная одежда в восточнославянских традиционных обычаях и обрядах XIX — начала XX в. М., 1984; Б а р т а ш э в і ч Г.А. Беларуская народная паэзія веснавога цыкла і славянская фальклорная традыцыя. Мн., 1985; Т а в л а й Г.В. Белорусское купалье: Обряд, песня. Мн., 1986; Пахаванні. Памінкі. Галашэнні. Мн., 1986; Б о р и с е н к о В.К. Весільні звычаі та обряди на Україні. Київ, 1988; К р у г л о в Ю.Г. Русские обрядовые песни. 2 изд. М., 1989; Земляробчы каляндар: (Абрады і звычаі). Мн., 1990; К у х а р о н а к Т.І. Радзінныя звычаі і абрады беларусаў: канец XIX—XX ст. Мн., 1993; Жаніцьба Цярэшкі. Мн., 1993; Беларускія народныя абрады / Скл. Л.П.Касцюкавец. Мн., 1994. *Л.М.Салавей, І.У.Саламевіч*

**АБРА́ДАВАЕ ПЕ́ЧЫВА**, адзін з элементаў сямейных і каляндарных святаў і *абрадаў* многіх народаў свету. На Беларусі ім сустракалі і частавалі гасцей, бралі ў поле, едучы першы раз сеяць, пакідалі ў полі на *дажынках*, давалі жывёле, каб добра вялася, ім клікалі вясной буслоў і г. д. На *радзіны* звычайна пяклі жытнія пірагі (дарылі бабкам-павітухам), якія з жартамі ламалі, каштавалі, елі з баршчом за святочным сталом. Жанчын, што ішлі ў *адведкі*, частавалі пірагамі (на Брэстчыне такі пірог наз. скрушок). На *вяселле* акрамя *каравая* пяклі пшанічныя пірагі маладым — месяц, падручнік, крыж (булка

з крыжам). Падручнік і крыж пяклі для маладой, з імі яна ехала да маладога і клала на века дзяжы свекрыві. Памінальнае печыва заўсёды было прэснае (мёртвы хлеб) — *корж, гарачыкі, галушкі, праснак*. Корж і гарачыкі крышылі ў *канун*, «па крошцы» раздавалі прысутным за жалобным сталом. На *Каляды* пяклі жытнія пірагі-каляднікі, якімі абдорвалі калядоўшчыкаў. На саракі выпякалі 40 піражкоў (птушкі з цеста, галушкі, варэнікі) з макам або з фасоляй (іх называлі *саракі*, жаваронкі, бапкі). У вялікі пост пяклі храсцы-крыжыкі, саху, барану (булку, абкладзеную шышкамі), якія бралі ў поле, едучы сеяць. На Благавешчанне пяклі пампушкі, *галёпы*, якімі сустракалі буслоў, на Вялікдзень — здобныя пірагі (*паскі*, калачы). На Палессі на Юр'я пяклі расянік і хадзілі з ім вакол жыта, у Бярозаўскім р-не гатавалі піражок-юрок і клалі ў жыта (калі жыта яго не закрывала, то гэта прадказвала дрэнны ўраджай). У некаторых мясцінах на Юр'я ішлі ў поле з хлебам і інш. частаваннем. На святы рабілі таксама варэнікі з хлебнага цеста з макам або канапляным семем (на Варвару, Міколу), каржы з мёдам (напярэдадні Купалля).

*Г.Ф.Вештарт.*

**АБРА́ДАВАЯ ПАЭ́ЗІЯ**, нар. паэтычная творчасць, звязаная з каляндарна-вытв. і сямейнымі абрадамі. Гл. *Каляндарна-абрадавая паэзія, Сямейна-абрадавая паэзія*.

**АБРА́ДАВІЧ** (Обрадовић) Дасітэй (да манаства Дзімітрый; каля 1739, в. Чакава, Югаславія — 28.3.1811), сербскі пісьменнік і асветнік, пачынальнік новай сербскай л-ры на нар. мове. Першы міністр асветы Сербіі (1811). Вучыўся ў Гале, Лейпцыгу, Вене. Вандраваў па Еўропе, у 1787 быў на Беларусі (г.Шклоў). У 1808 арганізаваў т. зв. Вялікую школу ў Бялградзе (пазней ун-т). У філас. і павучальных творах «Пісьмо да Харалампія» (1782), «Парады цвярозага розуму» (1784), «Байкі» (1788), «Збор розных павучальных рэчаў...» (1793), аўтабіягр. рамане «Жыццё і прыгоды Дзімітрыя Абрадавіча...» (ч. 1—2, 1783—88) выкрываў абскурантызм, змагаўся за рацыяналізм мыслення і гуманізм, адстойваў неабходнасць усеагульнай адукацыі, заклікаў паўд. славян да адзінства.

*Тв.*: Сабрана дела. Т. 1—3. Београд, 1961.

**АБРА́ДАВЫЯ СТРА́ВЫ**, адзін з элементаў сямейных і каляндарных святаў і *абрадаў* многіх народаў свету. Традыц. А.с. беларусаў — *каша, бліны, аладкі*, хлеб і інш. — выконвалі знакавую функцыю і звычайна суправаджалі магічныя абрадавыя дзеянні. Каша з цэлага зерня (ячменнага, прасянага і інш.) — неад'емная частка радзіннага, вясельнага, памінальнага, каляднага, жніўнага абрадаў. Цэнтр. месца ў святкаванні *радзін* адводзілася *бабінай кашы*. На другі дзень *вяселля* кашу падносілі маладой. На *памінкі* варылі салодкую ячную кашу, а таксама рытуальную памінальную страву — *канун*. Ва ўсх. Беларусі сярод памінальных страў былі *клёцкі*. Гал. А.с. каляднага святкавання была *куцця*; яе абносілі вакол хаты, ставілі на покуць, каб паспрыяць будучаму ўраджаю, верх з яе аддавалі курам, каб добра неслісяа. На бедную куццю гаспадар або старэйшая жанчына клікалі мароз, прыгаворваючы, каб ён не марозіў «ні кійкоў, ні гуркоў, ні аратаяў старых, ні пагонічаў мала-

Да арт. Абрады рэлігійныя. Хрышчэнне.

дых» (Гродзеншчына). Куцця, як і бліны, была атрыбутам варажбы. На Палессі жытнюю кашу бралі з сабой, ідучы першы раз жаць: нажаўшы першы сноп, тры разы бралі ў рот кашы, астатнюю выкладвалі ў сноп і завязвалі яго. З рытуальнай сімволікай ураджаю звязаны і велікодныя стравы: рэшткі асвячоных у царкве яек, пірагоў, *кумпяка* (косці) закопвалі на загонах. Адно велікоднае яйка захоўвалі да пачатку сяўбы (яго бралі з сабой, едучы першы раз сеяць). Асаблівая магічная сіла надавалася блінам і аладкам, якія сімвалізавалі сонца і яго гадавы круг (бліны абавязковая страва на *масленіцу* і *Каляды*). Да А.с. адносяцца і паўсядзённыя стравы, якія традыцыйна гатуюць у пэўныя святочныя або памінальныя дні. На бедную куццю варылі посны буračны боршч (квас), падкалочаны мукой або рошчынай, з грыбамі ці алеем, крупнік, *аўсяны кісель*, узвар з сушаных яблыкаў, груш, слію, пяклі бліны ці аладкі, ламанцы з цёртым макам (гл. *Лазанкі*); на багатую куццю — бліны з салам і каўбасой, боршч з мясам, крупнік, куццю з салам і інш. На масленіцу акрамя бліноў абавязковыя былі сыр і масла, на Вялікдзень — яйкі, сыр, масла, сала, мяса, па магчымасці— кумпяк, парася, на Купалле варылі кулагу. На памінальным стале (на *дзяды, радаўніцу*) абавязкова былі боршч з мясам або капуста, сытая каша, каўбаса, бліны. Гл. таксама *Абрадавае печыва*.

*Літ.*: Листова Н.М. Пища в обрядах и обычаях // Календарные обычаи и обряды в странах зарубежной Европы: Ист. корни и развитие обычаев. М., 1983. *Г.Ф.Вештарт.*

**АБРА́ДЫ РЭЛІГІ́ЙНЫЯ**, *абрады*, заснаваныя на эмацыянальна-вобразным ўвасабленні рэліг. ідэй і ўяўленняў; знешняя форма праяўлення рэлігійнасці. Кожная рэлігія мае сваю сістэму і рэгламентацыю А.р. Іх разнастайнасць абумоўлена асаблівасцямі веравучэння і нац.-этнічнымі традыцыямі, умовамі жыцця веруючых людзей. Напр., у хрысціянстве важнейшыя магічныя культавыя абрады, якія, паводле царк. веравучэння, надаюць людзям цудадзейную моц («боскае харaство») — таінствы: хрышчэнне, мірапамазанне, прычашчэнне, споведзь, царк. шлюб, ялееасвячэнне, пасвячэнне ў духоўны сан. У А.р. беларусаў цесна пераплятаюцца язычніцкія і хрысц. элементы.

*Г.П.Караткевіч.*

**АБРА́ЖАННЕ МАЯСТА́ТУ** (образженье маестату; ад лац. majestas вялікасць, гонар), юрыдычны тэрмін часоў ВКЛ, які азначаў замах на дзярж. ўладу; у шырокім сэнсе слова — дзярж. здрада, замах на гонар і годнасць вял. князя, распаўсюджанне лжывых, ганебных чутак пра яго. У адпаведнасці з артыкуламі Статута ВКЛ 1588 А.м. каралася смерцю.

**АБРА́З**, і к о н а, 1) у хрысціянскай рэлігіі (праваслаўе і каталіцызм) выявы Ісуса Хрыста, Маці Божай, святых на драўлянай дошцы, палатне, камені; сімвал, які з'яўляецца аб'ектам рэліг. ўшанавання. 2) Твор сярэдневяковага мастацтва (гл. *Іканапіс*), які мае культавае прызначэнне.

Першыя А. вядомы з 2 ст. н.э. Найб. стараж. А., што захаваліся, паходзяць з Пярэдняй Азіі. Культ А. як абавязковага элемента храма быў афіцыйна прыняты на 7-м Усяленскім саборы (786—787, Канстанцінопаль). Паводле хрысціянскага падання першаўзорам вобраза Хрыста з'явіўся адбітак яго твару на ўбрусе, а першыя выявы Маці Божай выканаў евангелістам Лукою. Асабліва шырока быў распаўсюджаны ў Візантыі, Егіпце, Эфіопіі, паўд.-слав. краінах, Грузіі. Для А. характэрны іканаграфічны канон, які вытрымліваецца стагоддзямі. Пад уплывам Візантыі ўзнік старажытнарускі А., класічныя ўзоры якога адносяць да канца 14—15 ст. (А.Рублёў, Феафан Грэк).

На Беларусі А. з'явіўся, верагодна, у канцы 10 ст. ў Полацку і Тураве. Першыя А. прывозілі з Візантыі, напр., Ефрасіння Полацкая падаравала мужчынскаму манастыру ў Полацку абраз «Маці Божая Адзігітрыя Эфеская», які яна атрымала ад імператара Мануіла Камніна. Бел. А. 11—15 ст.

ствараліся ў сферы правасл. візантыйска-балканскага ўплыву («Маці Божая Замілаванне» з-пад Брэста, «Успенне» з Мінска, 15 ст.). Фарміраванне самабытнай *беларускай іканапіснай школы* адбылося ў 16 ст. Найб. яркія творы належаць да 1-й пал. 17 ст. (група маларыцкіх абразоў 1648; «Нараджэнне Марыі» Пятра Яўсеевіча з Галынца, 1649; «Успенне» з Олтуша, 1650 і інш.). Для іх характэрна спалучэнне сімвалізму і кананічнасці сярэдневяковага мастацтва з натуральнасцю персанажаў і асяроддзя, характарнасцю вобразаў, элементамі навакольнай рэчаіснасці, засвоенымі з еўрап. Адраджэння. У 17—18 ст. выяўляюцца рэгіянальныя асаблівасці ў А. Зах. Палесся, Падняпроўя, Падзвіння, Міншчыны, звязаныя з цэнтрамі іканапісу (Брэст, Вільня, Віцебск, Пінск, Магілёў, Мінск, Полацк). А. маляваліся на дошках (да 16 ст. ўключна з каўчэгам) па клеемелавым грунце (ляўкасе) яечнай тэмперай, пазней у спалучэнні з алейнымі фарбамі. Фон гладкі, пазалочаны, з канца 16 ст. аздабляўся рэльефным раслінным арнаментам. З сярэдзіны 18 ст. пашыраецца А. на палатне. Асаблівую галіну бел. іканапісу ўтвараюць алтарныя А. з рысамі готыкі, рэнесансу, барока. Характэрнай аздобай А. былі *абклады*, накладныя чаканеныя метал. рызы («сукенкі»). Самастойны бел. А. знікае ў сярэдзіне 19 ст. з ліквідацыяй у 1839 уніяцтва.

*Літ.*: Гл. пры арт. *Іканапіс*. *А.А.Ярашэвіч.*

**АБРА́ЗА**, наўмысная знявага гонару і годнасці асобы, выказаная ў непрыстойнай форме. Можа наносіцца вусна, у пісьмовай форме або дзеяннем, публічна, у прысутнасці пацярпелага або завочна. Паводле КК Рэспублікі Беларусь з'яўляецца крымін. злачынствам.

**АБРАЗА́ННЕ**, абрад выдалення крайняй плоці мужчынскага палавога члена. Узнік у першабытным грамадстве. Праводзілася пры *ініцыяцыі*. Захавалася ў некат. народаў Аўстраліі, Акіяніі, Афрыкі, у рэліг. рытуале іудаізму (над немаўлятамі) і ісламу (над хлопчыкамі 7—10 гадоў).

**АБРАЗІ́ВЫ**, тое, што *абразіўныя матэрыялы*.

**АБРАЗІ́ЙНАЯ ТЭРА́СА**, б е н ч, прыбярэжная частка паверхні марскога дна, выпрацаваная *абразіяй*. Мае невял. схілы каля берага і большыя каля асновы. Старадаўнія А.т. бываюць пагружаныя (затопленыя) або паднятыя над узроўнем мора (у сукупнасці ўтвараюць прыморскую тэрасаваную раўніну).

**АБРАЗІ́ЎНА-ІМПУЛЬСНАЯ АПРАЦО́ЎКА**, від *ультрагукавой апрацоўкі*, пры якім паверхня крохкіх матэрыялаў апрацоўваецца імпульсным уздзеяннем абразіўных часцінак. Пры А.-і.а. ў зону апрацоўкі нагнятаецца суспензія абразіўных часцінак алмазу, вокісу алюмінію, карбіду крэмнію ці бору, рух якіх выклікаецца канцэнтратарам ультрагукавых ваганняў. Пры ўздзеянні на матэрыял часцінкі зразаюць яго, і апрацаваная паверхня капіруе форму рабочай часткі канцэнтратара. Крыніцай ваганняў з'яўляецца ультрагукавы генератар. А.-і.а. выкарыстоўваецца пераважна для фарміравання адтулін, поласцяў, фасонных паверхняў, *шліфавання*.

**АБРАЗІ́ЎНАЯ АПРАЦО́ЎКА**, апрацоўка металаў, каштоўных камянёў, горных парод, шкла, дрэва, пластмас і інш. матэрыялаў зразаннем тонкага слоя *абразіўным інструментам*. Асн. прызначэнне — забеспячэнне павышанай дакладнасці і якасці паверхні, што апрацоўваецца. Можа выкарыстоўвацца таксама для чарнавой абдзіркі паверхняў, рэзкі, знімання вял. прыпускаў. Да А.а. адносяцца *паліраванне*, *шліфаванне*, *ханінгаванне*, даводка, прыцірка, *абразіўна-імпульсная апрацоўка*, суперфінішаванне і г.д.

Да арт. Абраз. А.Рублёў. Спас. 1420-я гады.

Абраз «Сашэсце ў пекла» з Чачэрска. 1678. Нацыянальны мастацкі музей Беларусі.

Абраз «Маці Божая Іерусалімская» з Брэстчыны. 16 ст. Музей старажытнай беларускай культуры ІМЭФ АН Беларусі.

**АБРАЗІ́ЎНЫ ІНСТРУМЕ́НТ**, інструмент, рэзальнымі элементамі якога з'яўляюцца часцінкі (зярняты) *абразіўных матэрыялаў*. Адрозніваюць А.і. са звязаным абразівам (шліфавальныя кругі, брускі, сегменты, галоўкі), на эластычнай аснове (шліфавальная шкурка, стужка) і ў выглядзе свабоднага абразіву (парашок, паста, суспензія, зярняты).

Для звязвання (сцэментоўвання) абразіўных зярнят карыстаюцца керамічнай, бакелітавай, метал., вулканітавай звязкамі. Па цвёрдасці А.і. падзяляюць на мяккі, сярэднямяккі, сярэдняцвёрды, цвёрды, вельмі цвёрды і звышцвёрды. Звычайна эксплуатуюць з кругавой скорасцю да 30 м/с, а ўмацаваны А.і. (напр., кругі з электракарунду і карбіду крэмнію, арміраваныя тканінай, шкляной сеткай, метал. кольцамі) — да 100 м/с. Выкарыстоўваюць для *абразіўнай апрацоўкі* металаў.

**АБРАЗІЎНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ**, а б р а з і в ы, прыродныя ці штучныя матэрыялы павышанай цвёрдасці, якія выкарыстоўваюцца для *абразіўнай апрацоўкі* і вырабу *абразіўных інструментаў*. Да прыродных А.м. адносяцца *алмаз, граніт, кварц, карунд, крэмень*, наждак;

А.В.Абразцова.

С.У.Абразцоў.

да штучных — *электракарунд*, карбід крэмнію, карбід бору, кубічны нітрыд бору (эльбор, кубаніт), штучны алмаз (мае значна большую цвёрдасць, стабільнасць уласцівасцяў, інш. высокія тэхнал. якасці). Мікрацвёрдасць А.м. ад 18—26 ГПа (электракарунд) да 100 ГПа (сінт. алмаз), іх трываласць на сціскание адпаведна ад 760 да 2000 МПа.

**АБРА́ЗІЯ** (ад лац. abrasio саскрабанне), разбурэнне хвалямі і прыбоем берагоў акіянаў, мораў, азёраў, вадасховішчаў. Інтэнсіўнасць залежыць ад сілы хвалевага ўздзеяння, геал. будовы і стромкасці берагоў, велічыні нахілу прылеглай зоны дна і інш. У выніку А. ўтвараюцца абразійныя ўступы (кліфы), хвалепрыбойныя нішы, падводныя *абразійныя тэрасы* (бенчы). Працягласць абразійных участкаў берагоў вадаёмаў Зямлі складае каля 400 тыс. км (51% агульнай даўжыні). У многіх месцах на прадухіленне А. выдаткоўваюцца значныя матэрыяльныя сродкі.

**АБРАЗО́К**, малая празаічная форма ў бел. л-ры — замалёўка з слабаразгорнутым сюжэтам або без яго. У А. павялічваецца вобразна-экспрэсіўная нагрузка слова, яму ўласціва больш цеснае адзінства выказвання і настраёвасці. Як асобны від *эпасу* ўзнік на хвалі ажыўлення рамантызму ў канцы 19 — пач. 20 ст. Асн. разнавіднасці А.: рэалістычна-бытавы («Пяць лыжак заціркі» З.Бядулі), алегарычна-сімвалічны («Камень» Я.Коласа), сатырычны («Сведка» Ф.Багушэвіча). У сучаснай л-ры да жанру А. часта звярталіся М.Стральцоў, Ф.Янкоўскі, А.Карпюк, Я.Брыль, Б.Сачанка і інш.

**АБРАЗЦО́ВА** Алена Васілеўна (н. 7.7.1939, С.-Пецярбург), руская спявачка (мецца-сапрана), педагог. Нар. арт. СССР (1976). Скончыла Ленінградскую кансерваторыю (1964). З 1984 праф. Маскоўскай кансерваторыі. З 1964 салістка Вял. т-ра Расіі. Выступае ў буйнейшых т-рах свету («Ла Скала» і інш.). Сярод партый: Марфа, Марына Мнішак («Хаваншчына», «Барыс Гадуноў» М.Мусаргскага), Графіня («Пікавая дама» П.Чайкоўскага), Кармэн («Кармэн» Ж.Бізэ), Амнерыс («Аіда» Дж. Вердзі). 1-я прэмія на Міжнар. конкурсах імя П.І.Чайкоўскага (Масква), Ф.Віньяса (Барселона; абодва 1970). Дзярж. прэмія Расіі 1973, Ленінская прэмія 1976.

*Літ.*: Тимохин В.В. Е.Образцова: Творч. портрет. 2 изд. М., 1988; Шейко Р. Елена Образцова: Записки в пути. Диалоги. 2 изд. М., 1987.



Абразіўны інструмент: *1* — плоскі шліфавальны круг прамога профілю; *2* — круг канічнага профілю; *3* — шліфавальны круг-дыск; *4* — чашка цыліндрычная; *5* — галоўка шліфавальная цыліндрычная; *6* — галоўка шаравая; *7* — брусок шліфавальны; *8* — сегмент трапецападобны; *9* — брусок для ханінгавання.



Схема ультрагукавой абразіўна-імпульснай апрацоўкі: *1* — інструмент; *2* — абразіў; *3* — загатоўка.

**АБРАЦО́Ў** Сяргей Уладзіміравіч (5.7.1901, Масква — 8.5.1992), рускі тэатр. дзеяч, акцёр і рэжысёр. Нар. арт. СССР (1954). Герой Сац. Працы (1971). З 1931 кіраўнік Цэнтр. т-ра лялек у Маскве. Распрацаваў тэорыю і методыку т-ра, стварыў рэпертуар, выхаваў плеяду акцёраў і рэжысёраў. З 1973 праф. Дзярж. ін-та тэатр. мастацтва. Прэзідэнт Міжнар. саюза лялечнікаў (з 1976, з 1984 ганаровы прэзідэнт) і Сав. цэнтра гэтай арг-цыі (з 1958). Працаваў таксама ў кіно. Дзярж. прэмія СССР 1946, Дзярж. прэмія Расіі 1967, Ленінская прэмія 1984.

*Тв.*: О том, что я увидел, узнал и понял во время двух поездок в Лондон. М., 1957; Моя профессия. М., 1981.

*Літ.*: Смирнова Н.И. Театр Сергея Образцова. М., 1971.

**АБРАІ́МАЎ** Іван Васілевіч (8.3.1894, г. Анесі, Францыя — 2.12.1981), рус. фізік, стваральнік навук. школы па фізіцы цвёрдага цела і нізкіх тэмператур. Акад. АН СССР (1958, чл.-кар. 1933). Скончыў Петраградскі ун-т (1915). З 1919 у навук. установах Петраграда, Харкава, Масквы. Навук. працы па фізіцы крышталёў, оптыцы і оптатэхніцы. Распрацаваў метад вырошчвання монакрышталёў з расплаваў, заклаў асновы нізкатэмпературнай спектраскапіі, сканструяваў шэраг спектральных прылад. Дзярж. прэмія СССР 1946.

*Тв.*: О приложении френелевой дифракции для физических и технических измерений. М.; Л., 1945.

**АБРАКАДА́БРА** (лац. abracadabra), 1) магічная формула, таямнічае слова, якому знахарамі прыпісвалася цудадзейная сіла. 2) Незразумелы набор слоў ці выказванняў, бязглуздзіца.

**АБРА́МАВА** Антаніна Іванаўна (н. 1.3.1926, с. Канскае Прыморскага краю), бел. мастак у галіне маст. шкла. Скончыла Ленінградскае вышэйшае маст.-прамысл. вучылішча імя Мухінай (1953). З 1959 на Барысаўскім хрусталёвым з-дзе. Карыстаецца пераважна халоднымі тэхнікамі дэкарыравання шкла — алмазнай і аптычнай гранямі, пескаструменнай апрацоўкай, траўленнем.

*Літ.*: Беларускае мастацкае шкло: [Альбом]. Мн., 1978. *М.М.Яніцкая.*

Да арт. **Абразія**. Абразійныя астравы і кекуры ў заліве Пятра Вялікага.

**АБРА́МАВА** Надзея Аляксандраўна (30.3.1907, Мінская вобл. — ?), адзін з кіраўнікоў бел. маладзёжнага руху, наладжанага пад кантролем ням. акупац. улад на Беларусі ў 1943—44. Скончыла Бел. дзярж. вышэйшы пед. (1935) і Мінскі мед. (1940) ін-ты. У час акупацыі Беларусі ням. фашыстамі працавала ўрачом-псіхіятрам у Мінскай інфекцыйнай бальніцы. З кастр. 1942 узначальвала дзіцячы сектар *Беларускай народнай самапомачы*, з чэрв. 1943 — службу юначак *Саюза беларускай моладзі*. Уваходзіла ў *Беларускую цэнтральную раду*. Удзельніца 2-га Усебел. кангрэса (1944, Мінск). У час вызвалення Беларусі Чырв. Арміяй эмігрыравала на Захад. *С.У.Жумар.*

**АБРА́МАЎ** Ігар Іванавіч (н. 11.8.1954, г. Брэст), бел. вучоны ў галіне мікраэлектронікі. Д-р фіз.-матэм. н. (1994). Скончыў БДУ (1976). З 1976 у БДУ, з 1983 у Бел. ун-це інфарматыкі і радыёэлектронікі. Навук. працы па мадэляванні і аналізе фіз. працэсаў у элементах і фрагментах схем мікра- і нанаэлектронікі.

*Тв.*: Численное моделирование элементов интегральных схем. Мн., 1990 (разам з В.В.Харытонавым).

**АБРА́МАЎ** Кузьма Рыгоравіч (н. 12.11.1914, с. Старыя Найманы Вялікаберазнякоўскага р-на, Мардовія), мардоўскі пісьменнік. Засл. пісьменнік Мардовіі (1964). Аўтар рамана-трылогіі «Найман» (1957—64; пра жыццё мардоўскай вёскі 1920—50-х г.), раманаў «Свая ноша не цягне» (1967), «Сцяпан Эрзя» (1977, біягр.), «Дзяўчына з вёскі» (1980), зб-каў апавяданняў.

**АБРА́МАЎ** Максім Паўлавіч (17.1.1911, в. Хухарава Вялікаігнатаўскага р-на, Мардовія — 30.6.1973), акцёр. Засл. арт. Беларусі (1955). З 1930 у т-рах Расіі. З 1947 у Магілёўскім, з 1949 у Брэсцкім абл. драм. т-рах. Вострахарактарны акцёр. Лепшым работам А. ўласцівы жыццёвая праўда, зліццё з вобразам. Сярод роляў: Калеснікаў («Брэсцкая крэпасць» К.Губарэвіча), Калібераў («Выбачайце, калі ласка» А.Макаёнка), Гукан («Сэрца на далоні» паводле І.Шамякіна), Лабыш («Папараць-кветка» І.Козела), Заслонаў («Канстанцін Заслонаў» А.Маўзона), Яечня («Жаніцьба» М.Гогаля), Зыкаў («Зыкавы» М.Горкага), Прэзідэнт («Каварства і каханне» Ф.Шылера). *Р.М.Бакіевіч.*

**АБРА́МАЎ** Сямён Сямёнавіч (н. 7.11.1938, в. Глыбоцкае Гомельскага р-на), бел. вучоны ў галіне ветэрынарыі. Д-р вет. н. (1987), праф. (1988). Скончыў Віцебскі ветэрынарны ін-т (1960). З 1985 працуе ў Віцебскай акадэміі вет. медыцыны. Даследаванні па фізіятэрапеўт. метадах лячэння і прафілактыцы хвароб жывёл ва ўмовах Беларусі.

*Тв.*: Незаразные болезни молодняка. Мн., 1989 (у сааўт.); Профилактика незаразных болезней молодняка. М., 1990 (у сааўт.); Справочник по болезням сельскохозяйственных животных. 2 изд. Мн., 1990 (у сааўт.), Тлумачальны слоўнік-даведнік па ветэрынарыі і заатэхніі. Мн., 1992 (у сааўт.); Выращивание и болезни собак. Мн., 1993 (у сааўт.).

**АБРА́МАЎ** Фёдар Аляксандравіч (29.2.1920, в. Веркала Архангельскай вобл. — 14.5.1983), рус. пісьменнік. Скончыў Ленінградскі ун-т (1948). Аўтар тэтралогіі «Прасліны» (раманы «Браты і сёстры», «Дзве зімы і тры леты», «Шляхі-дарогі», «Дом», 1958—78; за першыя тры Дзярж. прэмія СССР 1975) пра жыццё рус. паўн. вёсак у гады Вял. Айч. вайны і пасля яе; аповесцяў «Бязбацькаўшчына» (1961), «Пелагея» (1969), «Драўляныя коні» (1970), «Алька» (1972), «Мамоніха» (1980), п'есы «Адзін бог для ўсіх» (1962), апавяданняў.

*Тв.*: Собр. соч. Т. 1—3. Л., 1980—82; Трава-мурава: Повести и рассказы. М., 1983.

А.Абрамава. Дэкаратыўныя вазы «Паўночнае зяянне». 1976.

**АБРА́МЕНКА** Дзмітрый Кузьміч (22.7.1910, в. Філіпкава Віцебскага р-на— 28.1.1981), поўны кавалер ордэна Славы. У Вял. Айч. вайну камандзір гарматы ст. сяржант А. вызначыўся ў баях пры вызваленні Севастопаля, Шаўляя, каля г. Пройсіш-Эйлаў (Усх. Прусія).

**АБРА́МЕНКА** Тамара Мікалаеўна (н. 26.11.1938, г. Смалявічы), бел. вучоны ў галіне цеплафізікі і малекулярнай фізікі. Д-р тэхн. н. (1987), праф. (1994). Скончыла Мінскі пед. ін-т (1960). З 1960 у Ін-це цепла- і масаабмену імя А.В.Лыкава, з 1980 у Ін-це прыкладной фізікі АН Беларусі. Навук. працы па тэрмадынаміцы працэсаў пераносу энергіі, цеплафіз. уласцівасцях газаў і іх сумесяў.

*Тв.*: Термическая диффузия в газах. Мн., 1982 (разам з А.Ф.Залатухінай, Я.А.Шашковым); Нелинейные эффекты в высокотемпературных газах // Обзоры по теплофизическим свойствам вещества. М., 1992.

**АБРА́МІС** Іосіф Самуілавіч (29.10.1918, Мінск — 29.9.1984), бел. дырыжор. Засл. дз. маст. Беларусі (1964). Скончыў Бел. кансерваторыю па класах валторны (1941) і оперна-сімф. дырыжыравання (1950). З 1936 у Дзярж. т-ры оперы і балета, у 1979 — 82 гал. дырыжор Дзярж. т-ра муз. камедыі Беларусі. Пад яго кіраўніцтвам пастаўлены: нац. оперы «Марынка» Р.Пукста і «Калі ападае лісце» Ю.Семянякі, аперэта «Несцерка»

Ф.А.Абрамаў.



А.І.Абрамовіч.

Р.Суруса, класічныя оперы «Баль-маскарад» і «Атэла» Дж. Вердзі, «Князь Ігар» А.Барадзіна, балеты «Спячая прыгажуня» П.Чайкоўскага, «Спартак» А.Хачатурана, «Жызэль» А.Адана, аперэта «Лятучая мыш» І.Штрауса і інш.

**АБРАМО́ВІЧ** Аляксандр Міхайлавіч (н. 10.4.1944, в. Забалацце Нясвіжскага р-на Мінскай вобл.), правазнавец, дзярж. дзеяч Беларусі. Д-р юрыд. н. (1986), праф. (1990). Скончыў БДУ (1973). Працаваў у Ін-це філасофіі і права АН Беларусі. З 1988 заг. кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права БДУ. У 1991—92 чл. К-та канстытуцыйнага нагляду СССР. З 1992 старшыня Цэнтр. камісіі па выбарах нар. дэпутатаў Рэспублікі Беларусь (з 1994 — па выбарах і правядзенні рэсп. рэферэндумаў). Працы па праблемах дзярж. буд-ва і заканадаўства, узаемадносін цэнтр. і мясц. органаў кіравання.

**АБРАМО́ВІЧ** Антон Іванавіч (1811?, Віцебскі пав. — пасля 1854), бел. кампазітар. Пасля 1832 жыў у Пецярбургу. Быў вядомы як піяніст-выканаўца і педагог, склаў школу ігры на фп. Адзін з першых пачаў ствараць нац.-характэрныя творы, у аснове якіх мелодыі бел. нар. песень і танцаў: праграмная 8-часткавая паэма «Беларускае вяселле», п'есы «Беларускія мелодыі», «Зачараваная дуда» для фп., песні «Дзеванька» і «Гарэліца» на словы Я.Баршчэўскага і інш.

*Літ.*: Мальдзіс А.І. Падарожжа ў XIX стагоддзе. Мн., 1969; Кісялёў Г. Радок у энцыклапедыю // Кісялёў Г. Героі і музы. Мн., 1982.

**АБРАМО́ВІЧ** Зігмунт Іосіфавіч (па сцэне Антон Забель; 25.6.1892, Масква — 20.3.1988), бел. акцёр. У 1909—10 удзельнік Гродзенскага гуртка бел. моладзі. У 1911 адзін з вядучых акцёраў *Першай беларускай трупы Ігната Буйніцкага*. Выконваў камедыйныя і ха-

рактарныя ролі: Пранцішак («Модны шляхцюк» К.Каганца), Бондар («У зімовы вечар» паводле Э.Ажэшкі), Скакунец («Пашыліся ў дурні» М.Крапіўніцкага) і інш. З 1919 жыў у Польшчы. Аўтар успамінаў пра Буйніцкага і бел. тэатр «Няходжанымі сцежкамі» (1971).

*Літ.*: Н я ф ё д У.І. Беларускі тэатр: Нарыс гісторыі. Мн., 1959. С. 98—101; С а б а л е ў с к і А.В. [Уступ да артыкула «Няходжанымі сцежкамі»] // Полымя. 1971. № 4.

*У.І.Няфёд.*

З.І.Абрамовіч.

**АБРАМО́ВІЧ** Людвік Кароль (5.7.1879, Масква — 9.3.1939), польскі гісторык, грамадскі дзеяч, журналіст, выдавец. Скончыў Ягелонскі ун-т у Кракаве. З 1905 у Вільні. З 1906 супрацоўнік газ. «Gazeta Wileńska» («Віленская газета»), «Kurier Wileński» («Віленскі веснік»). У 1911—38 рэдагаваў і выдаваў газ. «Przegląd Wileński» («Віленскі агляд»), дзе часта публікаваліся бел. аўтары, пісалася пра нац.-вызв. рух на Беларусі. У 1925—39 старшыня Навук. к-та садзейнічання б-цы Урублеўскіх (цяпер Цэнтр. б-ка АН Літвы). Быў звязаны з бел. грамадска-культ. жыццём у Вільні. У кн. «Чатыры стагоддзі кнігадрукавання ў Вільні, 1525—1925» (Вільня, 1925) пісаў пра дзейнасць Ф.Скарыны і яго паслядоўнікаў.

*А.В.Мальдзіс.*

**АБРАМО́ВІЧ** Марыян Станіслаў (25.3.1871, г. Цвер — 7.1.1925), удзельнік рэв. руху, дзеяч культуры Польшчы і Беларусі. У час вучобы ў Маскоўскім ун-це ўзначальваў гурток сацыяліст. кірунку ў маскоўскім польскім коле. У 1892 выдаў у Тыльзіце (Усх. Прусія) бел. агіт. брашуру «Дзядзька Антон», за што арыштаваны, прыгавораны да 3 гадоў турмы і 6 гадоў ссылкі, пасля якой жыў у Пецярбургу, узначальваў рабочую друкарню «Праца». У рэвалюцыю 1905—07 забяспечваў сувязь паміж Польскай сацыяліст. партыяй і рас. рэв. партыямі. З 1908 у Варшаве. З 1918 займаўся архіўнай і бібліятэчнай справай.

*Літ.*: С к а л а б а н В. Працяг гісторыі з «Дзядзькам Антонам» // Полымя. 1988. № 2.

**АБРАМО́ВІЧ** Франц Вікенцьевіч (1864, в. Клесель Рэчыцкага пав. — 10.6.1933), бел. хірург. Д-р медыцыны (1900). Скончыў Ваенна-мед. акадэмію ў Пецярбургу (1889). З 1914 урач у бальніцах Гомеля, Мазыра. Працы па даследаванні хвароб органаў брушной поласці, па клінічнай хірургіі і арганізацыі хірург. дапамогі.

**АБРАМО́ВІЧ** Эміль Абрамавіч (ліп. 1864, Гродна — 4.4.1922), адзін з першых прапагандыстаў марксізму на Беларусі. Скончыў Гродзенскую гімназію (1882), вучыўся на мед. ф-тах Парыжскага (1882—84) і Дэрпцкага (Тартускага, 1884—88) ун-таў. У 1884 арганізаваў у Мінску гурток друкарскіх рабочых с.-д. кірунку. У 1886—87 вёў прапаганду ў Вільні, меў сувязі з народнікамі. У 1889 стварыў с.-д. гурток у Кіеве, дзе арыштаваны і высланы ў Сібір. У 1896 у Мінску, неўзабаве выехаў на Ленскія прыіскі. У 1912 за артыкул для «Правды» пра Ленскі расстрэл сасланы ў Табольскую губ. У 1914—15 служыў урачом у арміі. З 1917 працаваў у Саратаве.

*М.В.Біч, Ф.І.Ігнатовіч.*

Да арт. Абрамцава-Кудрынская разьба. А.Паленава. Совы (уверсе), шафка. 1880-я гады.

**АБРАМО́ВІЧЫ** (А б р а г а м о в і ч ы), шляхецкі род герба «Ляліва» ў ВКЛ. Паходзілі ад Абрагама Ёзафавіча (п. у 1519), які нарадзіўся ў сям'і гандляраяўрэя, пазней прыняў хрысціянства. За паслугі вял. князям Аляксандру і Жыгімонту I атрымаў шляхецтва. Займаў пасады гараднічага (1495) і старосты ковенскага (1514), старосты салецкага, войта менскага і берасцейскага, падскарбія земскага (1510—19). Валодаў маёнткамі Вайдуны (Віленскі пав.) і Грынкава (Гарадзенскі пав.). Меў сыноў Васіля (у каталіцтве Ян, п. у 1546, быў войтам берасцейскім) і Канстанціна (войт менскі).

*В.Л.Насевіч.*

**АБРАМО́ВІЧЫ** (А б р а г а м о в і ч ы), шляхецкі род герба «Ястрамбец» у ВКЛ. Валодалі мяст. Варняны ў Віленскім пав. Найбольш вядомыя:

Я н (? — 19.4.1602), войскі і намеснік віленскі (1579), староста вендзенскі (1589), прэзідэнт дэрпцкі, ваявода менскі (1593) і смаленскі (1596). Адстойваючы інтарэсы ВКЛ, праваслаўнай царквы, быў у апазіцыі да Каралеўства Польскага. Адзін з гал. дзеячаў кальвіністаў. Пабудаваў у Варнянах кальвінісцкую царкву, шпіталь і школу. Быў звязаны з К.Астрожскім і Радзівіламі. Схіліў паэта Я.Радвана да напісання паэмы пра Радзівілаў (1592), апякаў кальвінісцкага палеміста А.Волана. Аўтар працы «Погляды літвіна аб набыцці таннага збожжа і продажу яго даражэй» (1595). Выдаў за свой кошт шэраг кніг. М і к а л а й (? — люты 1651), сын Яна. Ваяваў супраць шведаў у Курляндыі (1621—25), Прусіі і Памераніі (1626—27). У час вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1632—34 ваяваў пад Смаленскам. Ген. артылерыі, каштэлян (1640), ваявода мсціслаўскі (1643) і трокскі (1647). Падтрымліваў кальвіністаў. С а м у э л ь (1617—?), сын Мікалая. Староста старадубскі. Пасля смерці бацькі перайшоў у каталіцтва. А д а м (24.8.1710 — каля 1770), выкладчык філасофіі і гэалогіі, рэгент і 1-ы рэктар віленскага шляхецкага калегіума (Калегіум Нобіліум), рэктар калегіумаў у Нясвіжы, Мінску, Полацку. Аўтар кн. «Нядзельныя казанні» (1753). А н д р э й (? — вер. 1763), сын Самуэля. Стольнік віленскі (1742), каштэлян берасцейскі (1757). Ю р ы (Е ж ы; ?—?), падваявода віленскі (1750), падчашы віленскі, староста старадубскі (1763). М і к а л а й (1788—5.10.1835), сын Яўхіма. Маршалак Віленскага пав., камергер царскага двара. У 1812 на баку французаў, увайшоў у склад *Часовага ўрада Вялікага княства Літоўскага.* Удзельнік кампаній 1813, 1814. Пасля заканчэння вайны жыў у Варнянах і Вільні. Падаў праект віленскай шляхты аб паляпшэнні становішча сялян. І г н а ц ы (1793—1867), змагаўся ў напалеонаўскіх войсках у 1809—14. Пазней у складзе рас. войскаў ваяваў на Каўказе, ад'ютант Паскевіча (1829). Ген. корпуса жандараў.

**«АБРА́МЦАВА»**, гісторыка-мастацкі і літ. музей-запаведнік у Расіі. Створаны ў 1977 на тэр. б. сядзіб Абрамцава каля г. Загорск Маскоўскай вобл. (з 1843 належала Аксакавым, з 1870 — Мамантавым, з 1918 тут створаны музей) і Ахтырка.

У 19 ст. адзін з буйных цэнтраў культ. жыцця Расіі. У сядзібе ў С.Аксакава гасцявалі М.Гогаль, І.Тургенеў, М.Шчэпкін і інш. У 1870—90-я г. тут жылі і працавалі В.Васняцоў, І.Рэпін, В. і А. Паленавы, В.Сяроў, К.Каровін, М.Несцераў, М.Урубель і інш. Пры ўдзеле арх. В.Гартмана і І.Ропета ў парку пабудаваны ў «рус. стылі» студыя,

«Хатка на курыных ножках», царква, дача для мастакоў; створаны майстэрні разьбы па дрэве (гл. *Абрамцава-кудрынская разьба*) і маёлікі; пісаліся дэкарацыі для Мамантаўскага гуртка (паслужыў асновай Маскоўскай прыватнай оперы); у аматарскіх спектаклях удзельнічалі К. Станіслаўскі, Ф.Шаляпін.

*Літ.*: Поленова Н.В. Абрамцево: Воспоминания. М., 1922.

**АБРА́МЦАВА-КУ́ДРЫНСКАЯ РАЗЬБА́**, рускі маст. промысел разьбы па дрэве. Вядзе пачатак ад майстэрні, арганізаванай у 1882 А.Дз.Паленавай з мясц. майстроў с. Кудрына, Ахтырка і інш. у сядзібе Абрамцава (гл. *«Абрамцава»*). Бытавыя рэчы і сувеніры (шкатулкі, талеркі) з плоскарэльефнай разьбой (раслінны і геам. арнамент, фігуркі птушак, жывёл) і паліраванай паверхняй цяпер выпускае Хацькоўская ф-ка разных маст. вырабаў (г. Хацькова Маскоўскай вобл.).

*Літ.*: Василенко В.М. Русская народная резьба и роспись по дереву XVIII—XX вв. М., 1960.

**АБРАМЧУ́К** Мікалай Іванавіч (20.11.1910, в. Раманаўка Ваўкавыскага р-на Гродзенскай вобл. — 1.2.1974), Герой Сав. Саюза (1943). Скончыў ваен. школу лётчыкаў (1934). У Вял. Айч. вайну з чэрв. 1941 на Паўд.-Зах., Сталінградскім, 1-м Укр. франтах. Камандзір эскадрыллі знішчальнага авіяпалка. Зрабіў 300 баявых вылетаў, знішчыў 16 самалётаў праціўніка.

**АБРА́МЧЫК** Мікалай Сямёнавіч (16.8.1903, в. Сычавічы Маладзечанскага р-на — 29.5.1970), паліт. дзеяч, публіцыст. Скончыў Радашковіцкую бел. гімназію, з 1924 працягваў адукацыю ў Празе, дзе зблізіўся з прадстаўнікамі б. ўрада БНР (П.Крачэўскім, В.Захаркам і інш.). Жыў у Францыі, стварыў там «Хаўрус бел. працоўнай эміграцыі». Напярэдадні 2-й сусв. вайны ў Берліне, рэдактар газ. «Раніца» (1939—44), у 1940 арганізаваў Бел. к-т самапомачы. Потым працаваў у К-це самапомачы ў Беластоку. З 1944 у Парыжы, актыўна выступаў у бел. эмігрыйным друку. У 1943 і 1947—70 старшыня Рады БНР, у 1947 арганізаваў крывіцкую Раду БНР (т. зв. крывіцкі блок). *С.Б.Сачанка.*

**АБРА́МШЧЫНСКАЯ ШАРСЦЯНА́Я МАНУФАКТУ́РА**. Дзейнічала ў 1830—45 у пас. Абрамшчына Гродзенскага пав. Мела 6 станкоў. У 1844 працавалі 50 рабочых.

**АБРАМЯ́Н** Харэн Бабкенавіч (н. 1.4.1930), армянскі акцёр і рэжысёр. Нар. арт. Арменіі (1969), нар. арт. СССР (1980). Скончыў Ерэванскі маст.-тэатр. ін-т (1951). Артыст, рэжысёр, у 1980—85 гал. рэжысёр Дзярж. акад. т-ра імя Г.Сундукяна. Сярод роляў: Арам («Шэсцьдзесят гадоў і тры гадзіны» А.Араксманяна), Пэпо («Пэпо» Сундукяна), Атэла («Атэла» У.Шэкспіра) і інш. Пастаноўкі: «Аджы Пайлак» Г.Тэр-Грыгарана (1973), «Ацван» паводле Н.Зарана (1980). Здымаецца ў кіно. Дзярж. прэмія Арменіі 1979. Дзярж. прэмія СССР 1981.

**АБРАНТО́ВІЧ** Фабіян (14.9.1884, Навагрудак — 1940), бел. рэлігійны і грамадскі дзеяч. Магістр тэалогіі (1909), д-р філасофіі (1912). Скончыў Пецярбургскую акадэмію (1909), вучыўся ў каталіцкім ун-це ў Лувене (Бельгія). З 1914 выкладаў філасофію ў Петраградскай духоўнай акадэміі. Адзін з заснавальнікаў бел. хрысціянскага руху і яго саюза «Хрысціянская дэмакратычная злучнасць» (гл. ў арт. *Беларуская хрысціянская дэмакратыя*). Ініцыятар правядзення ў Мінску з'езда бел. каталіцкага духавенства (1917). З 1918 рэктар Мінскай духоўнай семінарыі (выкладаў і служыў імшу на бел. мове). З 1921 прэлат пінскай капітулы, з 1926 у Друйскім кляштары айцоў марыянаў. З 1928 вёў місіянерскую дзейнасць сярод рас. эмігрантаў у г. Харбін. У 1939 вярнуўся на Беларусь, дзе арыштаваны сав. ўладамі і зняволены ў турму ў Львове; пазней высланы ў Расію. *Г.В.Бабкін.*

**АБРА́СІМАЎ** Пётр Андрэевіч (н. 16.5.1912, Віцебск), сав. парт. і дзярж. дзеяч, дыпламат. Скончыў Віцебскі політэхнікум (1933), БДУ (1951). З 1929 на прафс. і адм.-гасп. рабоце. З 1942 у ЦК КП(б)Б і СНК БССР. З 1946 пастаянны прадстаўнік СМ БССР пры СМ СССР. З 1948 нам. старшыні СМ БССР, з 1950 сакратар ЦК КП(б)Б, з 1952 1-ы нам. старшыні СМ БССР. З 1956 пасол СССР у ПНР, Францыі і Малагасійскай рэспубліцы, ГДР, Японіі. У 1961—62 на парт. рабоце ў КПСС. Дэпутат ВС СССР у 1950—58, 1962—66, 1974—79, ВС БССР у 1951—59.

**АБРАСТА́ННІ**, перыфітон, сукупнасць водных арганізмаў, якія пасяляюцца на штучных (днішчы суднаў, буі, збудаванні на палях, трубаправоды, прычалы) і прыродных (камяні, карчы, вышэйшыя водныя расліны і інш.) цвёрдых субстратах. Складаюцца з бактэрый, грыбоў, прасцейшых, водарасцяў, чарвей, імшанак, малюскаў, губак. З'яўляюцца прыродным біяфільтрам, індыкатарам якасці вады, прадуцэнтам арган. рэчываў, кармавой базай і сховішчам для водных жывёл. Прыносяць вял. страты засмечваннем водазабіральных адтулін, трубаправодаў, памяншаюць скорасць руху суднаў і г.д.

**АБРА́Ў-ДЗЮРСО́** (ад абх. абраў правал + дзюрдсу чатыры крыніцы), пасёлак гар. тыпу ў Краснадарскім краі Расіі, за 14 км на З ад Новарасійска, на беразе воз. Абраў. Засн. ў 1871. Вінаграднікі, вытв-сць высакаякасных шампанскіх і сталовых він, маркі якіх атрымалі шырокую вядомасць. Турызм.

**АБРА́ХАМС** (Abrahams) Пітэр Генры (н. 19.3.1919, Врэдэдарп каля Іаганесбурга, ПАР), пісьменнік Паўд.-Афрыканскай Рэспублікі. Піша на англ. мове. Літ. дзейнасць пачаў у 1942. У творах закранае сац., паліт. і нац. праблемы краін афрыканскага кантынента. Аўтар раманаў «Шахцёр» (1945), «Сцежкаю грому» (1948; па гэтым рамане Бел. тэатр оперы і балета паставіў балет, муз. К.Караева, 1960), «Дзікі захоп» (1950), «Вянок для Удома» (1956; на бел. мову пераклаў С.Дорскі, 1959), «Ноч належыць ім» (1965), «Наш востраў сёння» (1966).

М.С.Абрамчык.

Ф.Абрантовіч.

*Тв.*: Рус. пер. — Горняк; Венок Майклу Удомо. М., 1988.

**АБРА́ШЫН** Вячаслаў Мікалаевіч (н. 22.7.1943, г. Ржэў Цвярской вобл., Расія), бел. матэматык. Д-р фіз.-матэм. н. (1979), праф. (1981). Скончыў БДУ (1966). З 1967 у Ін-це матэматыкі АН Беларусі. Адначасова з 1972 у БДУ. Навук. працы па вылічальнай матэматыцы і матэм. мадэляванні. Развіў тэорыю нелінейных рознасных схем для дыферэнц. ураўненняў у частковых вытворных, распрацаваў эканам. метады рашэння мнагамерных задач матэм. фізікі.

*Тв.*: О некоторых разностных схемах для задач лучистой теплопроводности // Докл. АН СССР. 1976. Т. 230, № 4; Об экономичных итерационных методах решения многомерных задач математической физики. II (разам з І.А.Дзюба) // Дифференциальные уравнения. 1994. Т. 30, № 2.

**АБРО́ВА**, вадасховішча ў Беларусі, у Івацэвіцкім р-не Брэсцкай вобл., на меліярац. канале ў бас. р. Ясельда. За 16 км ад вусця канала, каля в. Аброва. Створана ў 1985. Пл. 1,6 км$^2$, даўж. 1,82 км, найб. шырыня 1,2 км, найб. глыб. 4,9 м, аб'ём вады 7,1 млн. м$^3$. Пл. вадазбору каля 270 км$^2$. Выкарыстоўваецца для арашэння зямель і рыбагадоўлі.

**АБРО́ВА**, вёска ў Беларусі, у Івацэвіцкім р-не Брэсцкай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса імя Чапаева. За 38 км на Пд ад г. Івацэвічы, 175 км ад Брэста. 1720 ж., 617 двароў (1994). Сярэдняя школа, Дом культуры, амбулаторыя, аддз. сувязі.

**АБРО́К**, від феад. рэнты, якую землеўласнікі атрымлівалі ад прыгонных сялян. Спаганяўся прадуктамі с.-г. вытворчасці і промыслаў (натуральны А.) або грашыма (грашовы А.). Найб. ранняй формай быў прадуктовы А., які прыйшоў на змену раннесярэдневяковай *даніне*. У краінах Зах. Еўропы А. усталяваўся ў 12—13 ст. На Беларусі катэгорыя сялян-аброчнікаў вядома па гіст. крыніцах 14—16 ст., але А. тут быў мала пашыраны, пераважала *паншчына*. У Расіі А. быў адной з асн. формаў эксплуатацыі сялян, хоць часта спалучаўся з паншчынай. Пасля сялянскай рэформы 1861 заменены выкупнымі плацяжамі.

**АБРО́СІМАЎ** Павел Васілевіч (14.12.1900, с. Свабода Курскай вобл.— 21.3.1961), архітэктар. Вучыўся ў Ленінградскай АМ (1923—25). Адказны сакратар Саюза архітэктараў СССР (1955—61). Адзін з аўтараў будынкаў СМ Украіны ў Кіеве (1934—39), Маскоўскага ун-та (Дзярж. прэмія СССР 1949) і інш.

**АБРО́СІМАЎ** Пётр, разьбяр і цясляр канца 17 ст. Выхадзец з Беларусі. Працаваў у Палаце разьбярскіх і сталярскіх спраў Маскоўскага Крамля, «новым пацешным двары цара» ў Аляксандравай Слабадзе. У 1682—83 кіраваў арцеллю бел. разьбяроў, якая з арцеллю К.*Міхайлава* выконвала разныя іканастасы для Новадзявочага і Данскога манастыроў, у 1686 — для царквы Пятра і Паўла ў Маскве. Выконваў асабістыя заказы цара і царыцы (крэслы, ківаты, шуфляды, шкатулкі, падносныя сталы).

**АБРО́СІМАЎ** Хрыстафор, ювелір 17 ст. Выхадзец з Беларусі. Працаваў у Сярэбранай палаце Маскоўскага Крамля. У 1660—64 па асабістым загадзе цара рабіў «усялякія сярэбраныя суды і царкоўныя кадзілы».

**АБРО́ЎСКАЕ**, нізіннае балота ў Беларусі, у Івацэвіцкім, Бярозаўскім і Іванаўскіх р-нах Брэсцкай вобл., на вадазборы р. Ясельда. Пл. 22,9 тыс. га. Глыб. торфу да 4,5 м, сярэдняя 1,1 м. Часткова асушанае, выкарыстоўваецца пад сенажаць, збожжавыя і кармавыя культуры; на неасушаных участках пераважаюць хмызнякі, асокі і разнатраўе.

**АБРСКІЛ**, герой абхазскага гераічнага эпасу. Народжаны ад бязгрэшнай дзевы, А. хутка стаў непераможным волатам, абаронцам свайго народа.

**АБРУ́Б**, вёска ў Беларусі, у Глыбоцкім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Кірава. За 8 км на ПдУ ад г. Глыбокае, 200 км ад Віцебска. 321 ж., 117 двароў (1994). Сярэдняя школа, б-ка, Дом культуры, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі.

**АБРУ́Й**, кіраўнік паўстання бяднейшых слаёў насельніцтва ў 6 ст. ў *Согдзе* супраць мясц. арыстакратыі. Удзельнікі паўстання (вядома таксама як тыранія А.) захапілі г. Пайкенд. Многія прадстаўнікі вышэйшай знаці і купецтва ўцяклі ў Сямірэчча і папрасілі дапамогі ў правіцеля цюркаў Кара-Чурына, войскі якога разгромілі паўстанне каля 585. А. пакараны смерцю.

**АБРУ́С**, настольнік, настольніца, тканы, вязаны або плецены выраб для засцілання стала. Абавязковы атрыбут традыц. сямейнай і каляндарнай абраднасці беларусаў (накрывалі

Абрус. Вёска Сычоўка Мсціслаўскага раёна. 1930-я г.



Абрус. Веткаўскі р-н Гомельскай вобл.



Абрус, вязаны кручком. Лоеўскі раён Гомельскай вобл. 1930-я г.

стол на святы, уваходзіў у пасаг маладой). Выконваў важную ролю і ў дэкар. афармленні інтэр'ера вясковай хаты. А. (даўж. 1,5—2 м, шыр. 1—1,5 м) звычайна складаўся з 1 ці 2 сшытых полак ільняной даматканіны. Упрыгожваўся вышываным, набіваным арнаментам, аплікацыяй, карункамі, махрамі; полкі часта злучалі паскам карункаў, пазней карункавай прашвай, вязанай кручком. Вылучаюцца святочныя ўзорыстыя А. з каляровымі (пераважна чырвонымі) гладкімі ці арнаментальнымі палосамі па краях. У 1930—40-я г. былі пашыраны вышываныя А. па плеценай, вязанай або тканай сетцы. Разнастайнасцю арнаменту, дэтальнай распрацоўкай узораў вылучаюцца тонкія льняныя А. Віцебшчыны (паўажурныя, з празрыстым вытанчаным малюнкам і сеткавыя, вышытыя раслінным буйнарапортным паліхромным арнаментам). А. Магілёўшчыны з простымі ўзорамі, сціплай каларыстычнай гамаю. Багацце арнаментальных формаў, разнастайнасць сродкаў аздаблення ў А. Гомельшчыны. На Тураўшчыне А. аздаблялі раслінным арнаментам, вышытым крыжыкам (чырвона-чорнымі ніткамі) і яркай паліхромнай гладдзю. Дасканаласць прыёмаў аздаблення, тонкасць малюнка характэрны для неглюбскіх, калінкавіцкіх, лоеўскіх, нараўлянскіх А. У Зах. Палессі вылучаюцца тонкія драпічынскія А., тканыя з высакаякаснага адбеленага кужалю, паўажурныя камянецкія, іванаўскія А., дэкарыраваныя ляхавіцкія А., уся паверхня якіх заткана сакавітымі чырвонымі палосамі ўточных прокідак з шырокім шлякам па краі. Белае поле мотальскіх А. падзелена каляровымі ніткамі асновы і ўтку на клеткі і палоскі з дадаткам некалькіх радоў раслінна-геаметрызаванага арнаменту. Тканыя А. Панямоння і цэнтр. Беларусі стрыманыя па каларыце (пераважаюць серабрыстыя адценні шэрага і адбеленага кужалю). Бытавалі разнастайныя па тэхніцы ажурныя сеткавыя А. *В.Я.Фадзеева.*

**АБРУ́СНЫ**, асоба пры двары вял. князя ВКЛ, якая наглядала за сталовай бялізнай, у прыватнасці за абрусамі. З 16 ст. А. — танаровае званне.

**АБРУ́ЦА** (Abruzzo), нацыянальны парк у Італіі, у Абруцкіх Апенінах. Засн. ў 1923. Пл. больш за 29 тыс. га. Выш. да 2247 м над узр. м. Высакагорныя ландшафты, ледавікі, унікальныя геал. аб'екты, альпійская флора і фауна: асаковазлакавыя камяністыя альпійскія лугі, зараснікі рададэндрану; водзяцца воўк, мядзведзь, рысь, серна і інш. млекакормячыя.

**АБРУ́ЦЫ** (Abruzzi), адм. вобласць Італіі, на ўзбярэжжы Адрыятычнага мора. Падзяляецца на правінцыі Л'Акуіла, К'еты, Пескара, Тэрама. Адм. ц. — г. Л'Акуіла. Пл. 10,8 тыс. км$^2$. Нас. 1620 тыс. чал. (1993).

Узбярэжжа раўніннае, на З — Абруцкія горы (г. Корна, 2914 м). Клімат і расліннасць міжземнаморскага тыпу. Вобласць аграрная. Гал. культуры: пшаніца, кукуруза, цукр. буракі, бульба, на ўзбярэжжы — аліва, вінаград, цытрусавыя і інш. На горных пашах авечкагадоўля. Цукр., вінаробная, алейная, тытунёвая, хім., маш.-буд., электронная прам-сць. Развіта рыбалоўства.

**АБРЫКО́С** (Armeniaca), род дрэў і кустоў сям. ружавых. Вядома 10 відаў, пераважна ў Азіі. На Беларусі культывуецца А. звычайны (A. vulgaris), А. маньчжурскі інтрадукаваны Цэнтр. бат. садам АН Беларусі як дэкар. расліна.

Дрэва выш. да 8 м. Засухаўстойлівая, цепла- і святлолюбівая расліна. Лісце эліпсаабо яйцападобнае. Кветкі белыя, ружаватыя, распускаюцца раней за лісце. Меданос. Плод— мясістая касцянка, мае цукры, арган. к-ты, вітаміны; сушаныя плады — урук, курага. Ва ўмовах Беларусі пладаносіць 7—8 разоў за 10 гадоў, па 20—30 кг з дрэва, жыве да 40 гадоў, пач. плоданашэння на 4—5-ы год. Размнажаецца насеннем, сарты і формы— прышчэпкамі. Плады маюць радыепратэктарныя ўласцівасці, карысныя пры захворваннях сардэчна-сасудзістай сістэмы, печані, нырак. Сарты: Пінскі, Знаходка, Спадчына, Памяці Шаўчука. Асн. хваробы: парша костачкавых і кластэраспарыёз.

**АБРЫКО́САЎ** Аляксей Іванавіч (18.1.1875, Масква — 9.4.1955), рус. патолагаанатам. Акад. АН СССР (1939) і АМН СССР (1944). Герой Сац. Працы (1945). Чл.-кар. Польскай АН. Скончыў Маскоўскі ун-т (1899). У 1920—53 праф. 1-га Маскоўскага мед. ін-та, адначасова ў 1944—51 дырэктар Ін-та нармальнай і паталагічнай марфалогіі АМН СССР. Працы па марфалогіі туберкулёзу, алергічных рэакцыях, сепсісе, ранавай інфекцыі, паталогіі вегетатыўнай нерв. сістэмы. Дзярж. прэмія СССР 1942.

*Тв.*: Основы общей патологической анатомии. 9 изд. М., 1949; Основы частной патологической анатомии. 4 изд. М., 1950.

**АБРЫ́НСКІ** Хрыстафор (?, Навагрудак— 1665), дзярж. дзеяч ВКЛ. Сын новагародскага земскага суддзі. Вучыўся ў Нясвіжскім езуіцкім калегіуме (1637), Падуанскім ун-це (1641). З 1654 ротмістр кавалерыі ВКЛ, у 1654—62 пісар ВКЛ, з 1658 падкаморы новагародскі. Неаднаразова выбіраўся паслом на соймы ад шляхты Новагародскага ваяв. Быў сакратаром пасольства П.К.*Абуховіча* ў Маскве. Удзельнік падрыхтоўкі мірнага дагавору Рэчы Паспалітай са Швецыяй (1659, 1660). Як пасол сойма ад Старадубскага пав. ўдзельнічаў у размежаванні Інфлянтаў і Курляндыі. Валодаў маёнткамі Бярдова і Ятра (Новагародскае ваяв.), вёскамі ў Смаленскім ваяв. *П.Р.Казлоўскі.*

**АБРЫ́НЬБА** Мікалай Іпалітавіч (н. 2.3.1913, г.п. Епіфань Тульскай вобл.), рус. жывапісец. Засл. мастак Расіі (1969). Вучыўся ў Кіеўскім маст. ін-це (1936—40) і Маскоўскім маст. ін-це імя Сурыкава (1940—41). У 1944—50 у студыі ваен. мастакоў імя Грэкава. У Вял. Айч. вайну ўдзельнік партыз. руху на Беларусі. Асноўная тэма творчасці — гераізм бел. партызан. Сярод работ: «Эшалоны гараць» (1943), «Мост на Заходняй Дзвіне. 1942» (1970), «Франтавыя эцюды» (1976) і інш. Разам з мастаком М.Гуцievым стварылі партыз. карціннную галерэю, якая размяшчалася ў штабе Чашніцкай партыз. брыгады «Дубава».

**А́БРЫС** (ад ням. Abriß чарцёж, план), контур прадмета, нанесены на паперу з дапамогай ліній. 1) У геадэзіі — схематычны план участка мясцовасці з указаннем прамераў і тлумачальнымі надпісамі. Робіцца ад рукі ў полі пры некат. метадах наземнай тапагр. здымкі. Выкарыстоўваецца пры складанні дакладных тапагр. планаў, апазнаванні на аэраздымках пунктаў геадэзічнай сеткі, у турысцкіх паходах. 2) У архітэктуры 17 — 1-й пал. 18 ст. — схематычная лінейная выява плана будынка без паказу яго канструкцый, таўшчыні сцен і г.д. У 2-й пал. 18 ст. заменены арх. *праектам*, з выкарыстаннем планаў, фасадаў, разрэзаў і інш., якія давалі наглядное ўяўленне пра архітэктуру будынка. 3) У выяўленчым мастацтве — контурная выява прадмета, гл. *Контур*.

Абрыкос звычайны.

**АБРЫ́Ў**, схіл рачной даліны, берагоў мора, ракі, возера, вадасховішча, яра стромкасцю больш за 55°, вышынёй (глыб.) ад некалькіх да дзесяткаў метраў. На фарміраванне А. ўплываюць тэктанічныя рухі, працэсы абразіі (*кліф*), эрозіі (*рачныя тэрасы*) і інш. Пры замаруджванні ці спыненні гэтых працэсаў А. траціць стромкасць і паступова ператвараецца ў пакаты схіл. На Беларусі А. часцей бываюць на сугліністых і лёсападобных грунтах, радзей на месцах знаходжання былых вял. прыледавіковых азёраў.

**АБРЭВІЯТУ́РА** (італьян. abbreviatura ад лац. abbrevio скарачаю), 1) умове — назоўнік, утвораны шляхам спалучэння некалькіх слоў, якія ўваходзяць у новае часткамі. Абрэвіяцыя (утварэнне А.) як спосаб *словаўтварэння* пашырылася ў асн. еўрап. мовах на пач. 20 ст., у бел. мове — у 1920-я г. У сучаснай бел. мове паводле структуры вылучаюцца А.: ініцыяльныя (з пачатковых літар — ВНУ або гукаў — ААН), складовыя (з пачатковых частак слоў — сельмаг); змешанага (складова-ініцыяльнага) тыпу; утвораныя з часткі першага слова і канцавой — другога (мапед); з пачатковай часткі і цэлага слова (дзяржзаказ). 2) У музыцы — сімволіка муз. тэксту (спец. знакі, літары, лічбы), якая служыць для спрашчэння або скарачэння нотнага пісьма. А. спрашчэння абазначаюць паўтарэнне раздзелаў формы твора, элементаў муз. мовы, выканальніцкіх адценняў, паўз, перанясенне

М.Абрыньба. Мост на Заходняй Дзвіне. 1942. 1970.

гукаў на актаву і больш уверх ці ўніз. А. скарачэння выкарыстоўваюць у назвах муз. інструментаў, для пазначэння дынамічных і выразных адценняў, вакальніцкіх прыёмаў, а таксама ў назвах муз. тэм і твораў. *Т.Г.Мдывані (музыка).*

А.Абрэмбская-Яблонская.

**АБРЭВІЯ́ЦЫЯ** ў біялогіі, скарачэнне індывід. развіцця органаў або іх частак у жывёльных арганізмаў. Адбываецца ў выніку выпадання канечных стадый антагенезу, прыводзіць да недаразвіцця або рэдукцыі органаў у патомкаў. Тэрмін уведзены Б.С.Мацвеевым (1930); А.М.Северцаў назваў гэтую з'яву адмоўнай *анабаліяй*.

**АБРЭГО́Н** (Obregón) Альвара (19.2.1880, Сікісіва, штат Санора, Мексіка — 17.7.1928), мексіканскі дзярж. і ваен. дзеяч. У час рэвалюцыі 1910—17 узначаліў войска, якое скінула дыктатуру Уэрты (1914). У 1920—24 прэзідэнт Мексікі. Урад А. правёў шэраг дэмакр. рэформаў, імкнуўся да незалежнага знешнепаліт. курсу. У 1928 зноў выбраны прэзідэнтам, але забіты рэліг. фанатыкам да таго, як заступіў на пасаду.

**АБРЭ́ЗКА РАСЛІ́Н**, частковае ці поўнае выдаленне парасткаў і галін; прыём догляду пладова-ягадных і дэкар. раслін. Дапамагае сфарміраваць крону, павялічвае прадукцыйны перыяд плоданошэння, стымулюе штогадовае ўзнікненне вял. колькасці парасткаў і маладых пладовых утварэнняў.

Фарміравальную абрэзку робяць у маладым садзе, пры абрэзцы загушчаных крон і ўтварэнні новых галін з ваўчкоў, а таксама пасля перапрышчэплівання дрэў. Абрэзку, якая рэгулюе плоданошэнне, робяць у дарослых пладаносных дрэў, каб стварыць умовы для абнаўлення пладовай драўніны, павысіць ураджайнасць. Амаладжальную абрэзку старых дрэў і кустоў робяць, каб аднавіць рост і збалансаваць плоданошэнне. Звычайна ўсе віды А.р. праводзяць адначасова ў розных спалучэннях. Асн. прыёмы — пакарочванне (падрэзка) і выразка галін (прарэджванне). А.р. дзеля стварэння «жывых агароджаў» і аб'ёмных кампазіцый наз. стрыжкай.

*Літ.*: Апанасенка І.П. Ваш прысядзібны ўчастак. Мн., 1993; Кудрявец Р.П. Формирование и обрезка плодовых деревьев: [Альбом]. М., 1976.

**АБРЭ́МБСКАЯ-ЯБЛО́НСКАЯ** (Obrębska-Jabłońska) Антаніна (12.1.1901, в. Пчэльня, Украіна — 19.11.1994), даследчыца польскай, усх.-слав., у т.л. бел., моў. Д-р філал. н., праф. Адзін з арганізатараў і кіраўнік (1956—72) кафедры бел. філалогіі Варшаўскага ун-та. У 1953—57 кіравала секцыяй укр. і бел. філалогіі ў Польскасав. ін-це, у 1958—68 аддзелам бел. мовы ў Ін-це славяназнаўства Польскай АН. Асн. кірункі навук. прац — дыялектalогія, гісторыя і культура польск. мовы, русістыка, беларусістыка (польска-бел.-літоўскае моўнае памежжа, гісторыя мовы, анамастыка). Рэдактар (з М.В.Бірылам) «Падручнага польска-беларускага слоўніка» (1962). Кіравала падрыхтоўкай да выдання «Люду беларускага» М.Федароўскага (т. 5—7, 1958—69). Па яе ініцыятыве распачата вывучэнне гаворак Беласточчыны і выданне дыялектнага атласа рэгіёна (т. 1—3, 1980—89).



Да арт. **Абрэзка раслін**. *А*. Асноўныя прыёмы абрэзкі пладовых дрэў: *1* — пакарочванне; *2* — прарэджванне. *Б*. Абрэзка з мэтай змены напрамку росту галін: *1* — на галіну, якая расце ўверх; *2* — на галіну, якая расце да перыферыі кроны; *3* — на вонкавую галіну ў наступным годзе; *4* — тая самая галіна на трэці год. *В*. Абрэзка пры фарміраванні разрэджана-ярусная кроны: *1—4* — гады пасля пасадкі; злева — да абрэзкі, справа — пасля абрэзкі.

**Мадэль абсалютна чорнага цела.** *А* — выпрамяненне; *С* — поласць.

*Літ.*: Czurak M. Bibliografia prac Antoniny Obrębskiej-Jabłońskiej // Acta Baltico-Slavica. 1984. № 16. *І.У.Саламевіч.*

**АБРЭ́НАВІЧЫ** (Обреновићи), княжацкая [1815—42, 1858—82], потым каралеўская [1882—1903] дынастыя ў Сербіі. Заснавальнік *Мілаш Абрэнавіч*. У 1842—58 А. ў выгнанні. Правіцелі дынастыі А.: Мілаш [1815—39, 1858—60]; Міхаіл [1839—42, 1860—68]; Мілан [1868—89; з 1882 — кароль]; Аляксандр [1889—1903]. Апошні з А. Аляксандр забіты групай афіцэраў — прыхільнікаў *Карагеоргіевічаў*.

**АБСАЛЮ́Т** (ад лац. absolutus неабмежаваны, безумоўны), у ідэалістычнай філасофіі — вечнае, бясконцае, безумоўнае, дасканалы і нязменны суб'ект, які «самадастатковы», сам па сабе змяшчае ўсё існучае і стварае яго. У філасофіі Фіхтэ — гэта «Я», у Гегеля — сусветны розум (абсалютны дух), у Шапенгаўэра — воля, у Бергсона — інтуіцыя; у рэлігіі як А. выступае Бог.

**АБСАЛЮ́ТНА ЦВЁРДАЕ ЦЕ́ЛА**, ідэалізаваны аб'ект (цела), адлегласць паміж любымі двума пунктамі якога ўвесь час застаецца пастаяннай; адно з асн. паняццяў механікі. А.ц.ц. можна лічыць сістэму *матэрыяльных пунктаў*, жорстка звязаных паміж сабой, або кожнае рэальнае цела, памеры і форма якога ў працэсе руху і ўзаемадзеяння з інш. целамі не мяняюцца, г. зн., што дэфармацыя адсутнічае або настолькі малая, што яе можна не ўлічваць. Мадэль А.ц.ц. выкарыстоўваецца для тлумачэння ўласцівасцяў эўклідавай прасторы, вызначэння сістэмы адліку і апісання мех. руху рэальных аб'ектаў без уліку дэфармацыі.

**АБСАЛЮ́ТНА ЧО́РНАЕ ЦЕ́ЛА**, ідэалізаваны аб'ект, які поўнасцю паглынае эл.-магн. выпрамяненне, што падае на яго (паглынальная здольнасць роўная адзінцы). У прыродзе не існуе, хоць паглынальная здольнасць некаторых рэчываў (сажа, плацінавая чэрнь) блізкая да 0,95. Штучная мадэль А.ч.ц. (гл. рыс.) — вял. пустая замкнёная поласць з непразрыстымі сценкамі і маленькай уваходнай адтулінай. Пры звычайных т-рах выпрамяненне А, якое ўваходзіць праз адтуліну, шмат разоў адбіваецца ад сценак поласці С і практычна назад не выходзіць. Выпрамяненне А.ч.ц. вызначаецца толькі яго абс. т-рай, размеркаванне энергіі ў ім падпарадкоўваецца *Планка закону выпрамянення*. Адыгрывае важную ролю ў тэорыі эл.-магн. выпрамянення.

**АБСАЛЮ́ТНАЕ І АДНО́СНАЕ**, катэгорыі дыялектыкі. Абсалютнае абазначае безумоўнае, нестваральнае, вечнае, усеагульнае, характарызуе яго аўтаномнасць ад інш. формаў. Адноснае (рэлятыўнае) выступае як умоўнае, апасродкаванае, якое залежыць ад тых або інш. умоў і, значыць, часовае, недаўтавечнае, спароджанае. У стараж.-грэч. філасофіі абсалютнае вызначалася як

дасканаласць, завершанасць, самадастатковасць існага і выражалася ў паняццях «па прыродзе», «у чыстым выглядзе», «само па сабе». У Арыстоцеля адноснае выступае як нешта, што залежыць ад інш. ці адносіцца да яго. У сярэдневяковай філасофіі існавала рэліг. тлумачэнне абсалютнага як «божага», якое процістаіць «зямному», «свецкаму». У філасофіі Новага часу (асабліва ў ням. класічным ідэалізме) выпучаюцца розныя аспекты А. і а., якія раскрываюцца ў сістэме катэгорый «у сабе», «для іншага», «для сябе», «само па сабе» і да т.п. Для *метафізікі* характэрны адрыў абсалютнага ад адноснага. *Рэлятывізм* зыходзіць з разумення адноснага толькі як рэлятыўнага, якое выключае момант абсалютнасці. У розных формах *ідэалізму* абсалютнае ўяўляецца як самадастатковая існасць— *абсалют*. З пункту гледжання матэрыялісг. дыялектыкі процілеглась А. і а. не выключае, а дапускае іх адзінства, узаемасувязь. Пра абс. і адносную ісціну гл. ў арт. *Ісціна*.

*Літ.*: Кураев В.И., Лазарев Ф.В. Точность, истина и рост знания. М., 1988; Социально-философские проблемы производства и применения научных знаний. Мн., 1992.

**АБСАЛЮ́ТНАЯ ВЕЛІЧЫНЯ́** рэчаіснага ліку, велічыня, роўная гэтаму ліку, калі ён дадатны, роўная процілегламу ліку, калі ён адмоўны, і роўная нулю, калі лік роўны нулю. А.в. ліку a абазначаецца (a). Напр., (+2) = (-2) = 2, (0) = 0. А.в. (або модуль) *камплекснага ліку* a + bi, дзе a і b — рэчаісныя лікі, роўныя $(a + bi) = \sqrt{+a^2 + b^2}$. Напр., (i) = (-i) = 1, (3 + 4i) = 5.

**АБСАЛЮ́ТНАЯ ВІЛЬГО́ТНАСЦЬ ПАВЕ́ТРА**, колькасць вадзяной пары ў адзінцы аб'ёму паветра, адна з характарыстык *вільготнасці паветра*. Выражаецца ў грамах на кубічны метр. Вагаецца ад 0,1—1 г/м$^3$ (зімой над мацерыкамі, у палярных шыротах) да 30 г/м$^3$ і больш (у экватарыяльнай зоне). На Беларусі — ад 1,5 г/м$^3$ зімой да 14 г/м$^3$ летам.

**АБСАЛЮ́ТНАЯ ВЫШЫНЯ́**, абсалютная адзнака, адлегласць па вертыкалі ад якога-небудзь пункта на паверхні зямлі да сярэдняга ўзроўню паверхні акіяна. Для мясціны, вышэйшай за ўзроўневую паверхню, А.в. дадатная, для ніжэйшай — адмоўная. Найвыш. пункт Зямлі — г. Джамалунгма (8848 м), найб. нізкая адзнака Зямлі — узбярэжжа Мёртвага мора (-395 м); на Беларусі адпаведна г. Дзяржынская (345 м) і пойма р. Нёман на мяжы з Літвой (80 м). Для геадэзіі і гравіметрыі на тэр. рэспублікі за зыходную ўзроўневую паверхню прыняты сярэдні ўзровень Балтыйскага м., адзначаны нулявым дзяленнем на Краштацкім футштоку.

**АБСАЛЮ́ТНАЯ ГЕАМЕ́ТРЫЯ**, сукупнасць геам. палажэнняў, якія не залежаць ад пастулата аб паралельных прамых. Агульная частка для *эўклідавай геаметрыі* і *Лабачэўскага геаметрыі*.

**АБСАЛЮ́ТНАЯ ЗО́РНАЯ ВЕЛІЧЫНЯ́**, гл. ў арт. *Зорная велічыня*.

**АБСАЛЮ́ТНАЯ ІДЭ́Я**, катэгорыя ідэаліст. філасофіі аб звышнатуральным, хоць нічым не абгрунтаваным духоўным пачатку. Найб. поўна распрацавана *Гегелем*. А. і. не мае першапрычыны свайго ўзнікнення і існавання, сама выступае ў якасці стваральніка ўсяго існага. Вызначаецца рухомасцю і зменлівасцю самаўвасаблення. Развіваецца дыялектычна па схеме трыяды: тэза, антытэза, сінтэз. Тэза (сцвярджэнне) — А.і. існуе сама ў сабе, характарызуецца самаразвіццём і магчымасцю ў патэнцыі ўзнікнення матэрыяльнага. Антытэза (адмаўленне тэзы) — А.і., абвяргаючы свой першапачатковы стан (тэзу), матэрыялізуецца і існуе ў форме прыроды і чалавека. На гэтым этапе ўзнікае сістэма прыродных прадметаў і чалавека. Сінтэз (знясце супярэчнасцяў) — у выніку развіцця прыроды і чалавека ўзнікае свядомасць, якая выяўляецца ў 3 формах: мастацтве (у выглядзе вобраза), рэлігіі (уяўлення), філасофіі (паняццяў). *М.В.Анцыповіч.*

**АБСАЛЮ́ТНАЯ ІСЦІНА**, гл. ў арт. *Ісціна*.

**АБСАЛЮ́ТНАЯ МАНА́РХІЯ**, гл. *Абсалютызм*.

**АБСАЛЮ́ТНАЯ ТЭМПЕРАТУ́РА**, тэмпература, якая адлічваецца ад *абсалютнага нуля*. У тэрмадынаміцы вызначана ў вобласці дадатных т-р, дзе працягваецца на +∞. Вымяраецца ў *кельвінах*. Асн. рэперны пункт шкалы А.т.— т-ра *трайнога пункта* вады. *Параметр стану* сістэмы многіх часціц, якая знаходзіцца ў стане тэрмадынамічнай раўнавагі (пры гэтым А.т. ўсіх яе макраскапічных падсістэм аднолькавая). Пры звычайных умовах у стане раўнавагі часціцы размеркаваны па энергіях так, што на высокіх узроўнях знаходзіцца менш часціц, чым на нізкіх (гл. *Больцмана размеркаванне*). А.т. +∞ адпавядае раўнамернае размеркаванне часціц па ўсіх узроўнях энергіі, адмоўнай — т.зв. інверсная заселенасць узроўняў энергіі (на высокіх узроўнях больш часціц, чым на нізкіх). Таму лічаць, што з пунктам +∞ супадае пункт -∞, вышэй за якім знаходзіцца вобласць адмоўных т-р.

**АБСАЛЮ́ТНЫ НУЛЬ**, пачатак адліку *абсалютнай тэмпературы* па шкале Кельвіна; знаходзіцца на 273,16 К ніжэй за трайны пункт вады. Адпавядае стан з найменшай магчымай энергіяй, пры якой часціцы (атамы і малекулы) выконваюць т.зв. «нулявыя» ваганні. Пры А.н. ўсе рэчывы, акрамя гелію, знаходзяцца ў цвёрдым крышталічным стане. Атрыманы т-ры, якія толькі на мільённыя долі градуса адрозніваюцца ад А.н., аднак на практыцы А.н. недасягальны (гл. *Нернста тэарэма*). Пры ахаладжэнні да т-р, блізкіх да А.н., некаторыя рэчывы набываюць *звышцякучасць*, *звышправоднасць* і інш. своеасаблівыя ўласцівасці.

**АБСАЛЮ́ТНЫ ЎЗРО́СТ**, гл. ў арт. *Радыелагічны ўзрост*.

**АБСАЛЮ́ТНЫЯ СІСТЭ́МЫ АДЗІНАК**, сістэмы адзінак, у якіх вытворныя адзінкі вызначаюцца праз абмежаваную колькасць асноўных. У лік асн. выбіраюцца гал. чынам адзінкі даўжыні, масы і часу. Ідэя стварэння А.с.а. належыць К.Ф.*Гаўсу* (за асн. адзінкі прыняў міліметр, міліграм і секунду). Да А.с.а. адносяцца сістэма адзінак СГС (сантыметр, грам, секунда) і *натуральныя сістэмы адзінак*. Гл. таксама *Адзінкі фізічных велічынь*, *Сістэмы адзінак*.

**АБСАЛЮТЫ́ЗМ**, абсалютная манархія, форма дзярж. кіравання, калі дзярж. ўлада неабмежавана належыць адной асобе. Пры А., які прыйшоў на змену *саслоўнай манархіі*, дасягаецца найвыш. ступень цэнтралізацыі з разгалінаваным бюракратычным апаратам, пастаяннай арміяй і паліцыяй. А. дасягнуў росквіту ў краінах Зах. Еўропы ў 17—18 ст. У Расіі існаваў у 18—пач. 20 ст. (гл. *Самадзяржаўе*). А. тармазіў далейшае развіццё капіталіст. адносін. Ліквідаваны ў большасці краін бурж. рэвалюцыямі, у Расіі — Лют. рэвалюцыяй 1917.

**АБСАРБЦЫЙНАЯ МІКРАСКАПІ́Я**, метад *мікраскапіі* біял. аб'ектаў, заснаваны на рэгістрацыі мікраспектрафатометрамі выбіральнага паглынання святла ўнутрыклетачнымі структурамі. Выкарыстоўваецца для выяўлення, вызначэння канцэнтрацыі і вывучэння размеркавання ў клетках ці іх арганоідах бялкоў, нуклеінавых кіслот, стэроідаў, цытахромаў, гемаглабіну, некаторых вітамінаў, хларафілаў і інш. рэчываў, якім уласцівы спецыфічныя спектры паглынання. Магчымасці А.м. павялічваюцца пры выкарыстанні фарбавальнікаў, якія спецыфічна звязваюцца з рознымі рэчывамі клетак. Уласная і выкліканая (абумоўленая фарбавальнікамі) люмінесцэнцыя ўнутрыклетачных злучэнняў вызначаецца пры дапамозе люмінесцэнтнага мікраспектральнага аналізу і фотаметрычных зондаў.

**АБСЕ́НТ** (франц. absinthe) спіртны напітак; горкая *настойка*, якая рыхтуецца з вытрыманага 1 сут спіртавога настою травы *палыну*.

**АБСЕНТЭ́ІЗМ** [ад лац. absens (absentis) які адсутнічае], 1) абыякавыя адносіны насельніцтва да паліт. жыцця краіны, ухіленне ад удзелу ў ім. Асабліва выяўляецца ў нежаданні ўдзельнічаць у галасаванні на выбарах рознага ўзроўню. У большасці краін, у т.л. на Беларусі, удзел у галасаванні разглядаецца зака-

надаўствам як суб'ектыўнае права выбаршчыка. Паводле законаў Аўстрыі, Бельгіі, Грэцыі, Данії і інш. краін галасаванне з'яўляецца грамадзянскім абавязкам выбаршчыка, за невыкананне якога прадугледжаны адпаведныя адм., крымінальныя і інш. санкцыі. 2) Форма землеўладання, пры якой уладальнік зямлі без непасрэднага ўдзелу у працэсе вытворчасці атрымлівае грашовы прыбытак г.зв. земляробскі А.

*А.М.Абрамовіч.*

**АБСЕРВАТО́РЫЯ** (ад лац. observare назіраць), спецыялізаваная навук. ўстанова для правядзення астр. і геафіз. (магн., метэаралагічных, сейсмічных і інш.) назіранняў і даследаванняў. Гл. *Астранамічныя абсерваторыі*, *Геафізічныя абсерваторыі*.

**АБСЕРВА́ЦЫЯ**, 1) у навігацыі — вызначэнне геагр. каардынат судна ў моры па назіраннях аб'ектаў з вядомымі каардынатамі. Навігацыйную А. праводзяць па адзначаных на карце берагавых арыенцірах, астранавігацыйную— па нябесных свяцілах, каардынаты якіх даюцца ў Марскіх астр. штогодніках, радыёнавігацыйную — па напрамку на крыніцу радыёхваляў (напр., радыёмаякі, навігацыйныя ШСЗ). Усе спосабы А. зводзяцца да графічнага знаходжання пункта на марской карце або аналітычнага разліку яго каардынат. 2) У медыцыне — назіранне на працягу пэўнага часу за ізаляванымі ў спец. памяшканні людзьмі, якія маглі мець кантакт з хворымі на небяспечныя *каранцінныя хваробы*. Зрэдку ў такім жа значэнні тэрмін выкарыстоўваецца ў ветэрынарыі і фітапаталогіі ў дачыненні да завезеных жывёл, раслінных матэрыялаў.



Схема абсорбера: *1* — перагародка; *2* — патрубак; *3* — каўпак; *4* — пераліўная трубка; *5* — абсарбент.

**АБСІДЫЯ́Н** (ад лац. Obsidianus lapis камень Абсідыя), прыроднае *вулканічнае шкло* чорнага, цёмна-шэрага, карычневага, чырвонага колераў, з рэжучым сколам. Бляск шкляны. Цв. 5. Шчыльн. 2500—2600 кг/м$^3$. Лёгка паліруецца. Утвараецца пры хуткім ахалоджванні вязкай кіслай лавы. Выкарыстоўваецца як напаўняльнік лёгкіх бетонаў і вырабны камень.

**АБСКУРАНТЫ́ЗМ** [ад лац. obscurans (obscurantis) які зацямняе], супрацьдзеянне прагрэсу пазнання і асветы ў імя захавання старых вераванняў, якія лічацца вечнымі, непахіснымі; тое, што і цемрашальства.

**АБСО́РБЕР** (ад лац. absorbere паглынаць), апарат для паглынання (*абсорбцыі*) газаў з іх сумесі вадкімі абсарбентамі. У хім. і нафтаперапр. прам-сці выкарыстоўваюць некалькі канструкцый. Паверхневы А. — рэзервуар з абсарбентам, над паверхняй якога прапускаюць газ, і кампаненты газавай сумесі часткова паглынаюцца абсарбентам. Выкарыстоўваюць, калі газавая сумесь добра раствараецца ў абсарбенце. Насадачны А. — верт. метал. або керамічная калона (труба) з некалькімі гарыз. рашоткамі, на якія насыпаюць слаі насадкі (кокс, каменне, метал. або керамічныя кольцы і інш.). Абсарбент падаецца зверху і праз насадку сцякае ўніз, а сумесь газаў — знізу. У талерчатым А. (гл. рыс.) газавую сумесь з рэчывамі, якія неабходна выдаліць, прадзімаюць знізу ўверх праз абсарбент, што сцякае з талеркі на талерку па пераліўных трубках. Адбываецца барбатаж (перамешванне) вадкасці з газам, што спрыяе паглынанню рэчываў абсарбентам. А. выкарыстоўваюць і ў сістэмах жыццезабеспячэння касм. апаратаў.

Вежа тэлескопа астранамічнай абсерваторыі.



Абсідыян.

**АБСО́РБЦЫЯ**, 1) паглынанне рэчыва з газавай сумесі вадкасцю. Адбываецца ва ўсім аб'ёме паглынальніка, праводзіцца ў *абсорберах*. Выкарыстоўваецца ў хім. вытв-сці (напр., пры атрыманні азотнай, салянай, сернай кіслот, соды), а таксама пры ачыстцы газаў, у аўтаномных сістэмах жыццезабеспячэння. 2) Паглынанне эл.-магн. выпрамянення або гуку пры праходжанні праз рэчыва (гл. *Паглынанне святла*, *Паглынанне гуку*).

**АБС-ПЛА́СТЫК**, тэрмапластычны матэрыял з 2-фазнай структурай, супалімер *акрыланітрылу*, *бутадыену* і *стыролу*. Непразрысты, звычайна цёмнага колеру, t размякчэння 90—105°С, шчыльн. 1,08 · 10$^3$ кг/м$^3$.Растваральны ў араматычных і хлараваных вуглевадародах, вільгаце-, масла-, бензіна-,кіслота-, шчолачаўстойлівы; з высокімі мех. трываласцю, цепластойкасцю, жорсткасцю. Атрымліваюць радыкальнай палімерызацыяй стыролу з акрыланітрылам у прысутнасці каўчукавага латэксу. Канструкцыйны матэрыял для аўтамабіле-, машына-, прыладабудавання, тэкст. і харч. прам-сці, на выраб спарт. інвентару, мэблі; напаўняльнік некаторых палімераў.

**АБСТРА́КТНАЕ І КАНКРЭ́ТНАЕ**, катэгорыі дыялектыкі, у якіх адлюстраваны расчляненне і цэласнасць з'яў рэчаіснасці і іх узнаўленне ў працэсе пазнання. Абстрактнае разглядаецца як адна з уласцівасцяў, частка цэлага, аднабаковае, неразвітое; канкрэтнае — як адзінства, паўната, шматбаковасць і цэласнасць аб'екта ва ўсёй разнастайнасці яго сувязяў і дачыненняў. У гісторыі філасофіі да Г. Гегеля канкрэтнае ўяўлялася гал. чынам як разнастайнасць адзінкавых рэчаў і з'яў, дадзеных праз адчуванні; абстрактнае — як характарыстыка прадуктаў мыслення (*абстракцыя*). Гегель, які ўпершыню ўвёў у філасофію паняцці А. і к. як суадносных катэгорый дыялектыкі, разглядаў канкрэтнае як сінонім дыялектычнай узаемасувязі, падзеленай цэласнасці, а абстрактнае — як этап руху і развіцця самога канкрэтнага. І.Кант, І.Фіхтэ і інш. прадстаўнікі ідэалізму таксама зыходзілі з разумення канкрэтнага як выключна духоўнай у сваёй аснове сувязі эмпірычна дадзеных з'яў. Прыхільнікі *эмпірызму* зводзяць канкрэтнае толькі да адзінкавых успрымальных адчуваннем з'яў, а розныя школы *пазітывізму* — да індывід. аб'екта, які ўспрымаецца імі як комплекс адчуванняў. У дыялект. матэрыялізме канкрэтнае разглядалася як непасрэдна дадзенае пачуццёва ўспрымальнае цэлае і як сістэма навук. вызначэнняў, якая выяўляе істотныя сувязі і дачыненні рэчаў, заканамернасці і тэндэнцыі развіцця з'яў; абстрактнае ж — як праява непаў-

наты, неразвітасці, абмежаванасці любога яе фрагмента, праява аднабаковасці ведаў аб прадмеце. Спосаб тэарэт. ўзнаўлення ў свядомасці цэласнага аб'екта — узыходжанне ад абстрактнага да канкрэтнага, якое ёсць усеагульная форма разгортвання навук. пазнання, сістэма адлюстравання аб'екта ў паняццях.

*Літ.*: Гот В.С., Семёнов В.С., Урсул А.Д. Категории современной науки. М., 1984; Подкорытов Г.А. О природе научного метода. М., 1988.

**АБСТРА́КТНАЕ МАСТА́ЦТВА,** беспрадметнае мастацтва, нонфігуратыўнае мастацтва, плынь у выяўленчым мастацтве многіх краін, у аснову якой пакладзены метад *абстракцыянізму*. Узнікла ў 1910—13 у выніку расслаення *кубізму*, *экспрэсіянізму*, *футурызму*. Першыя абстрактныя кампазіцыі стварылі рус. мастак В.Кандзінскі, які працаваў у Германіі, француз Р.Дэланэ, іспанец Ф.Пікабія, чэх Ф.Купка, у Нідэрландах П.Мондрыян, у Расіі К.Малевіч, М.Ларыёнаў, Н.Ганчарова і інш. Пасля 1-й сусв. вайны тэндэнцыі А.м. праяўляліся ў некат. творах *дадаізму* і *сюррэалізму*; у архітэктуры, дэкар. мастацтве, дызайне (эксперыменты групы «Стыль» і «Баўтауз»).

Практыка А.м. зводзіцца да складання з дапамогай адцягненых элементаў маст. формы (каляровая пляма, лінія, аб'ём і г.д.) нявыяўленых кампазіцый, імпульсіўнастыхійных ці рацыяналістычна ўпарадкаваных. Да сярэдзіны 20 ст. вызначаліся 2 асн. кірункі — экспрэсіянісцкі і геаметрычны абстракцыянізм. Прадстаўнікі першага (Кандзінскі, Дж.Полак, Дэланэ і інш.) імкнуліся да самаст. гучання колеру, лірызму, пошуку вечнай духоўнасці і беспрадметнага свету. Мастакі другога кірунку (Малевіч, Мондрыян) карысталіся абстрактна ўпарадкаванымі, амаль што геам. формамі, пабудовамі, канструкцыямі. У сярэдзіне 20 ст. ў ЗША узнікла школа т. зв. «абстрактнага экспрэсіянізму» (Полак, М.Тобі), які развіўся ў многіх краінах (пад назвай ташызм або «бясформеннае мастацтва») і абвясціў сваім метадам «чысты псіхал. аўтаматызм», вынікам якога стала абсалютызацыя самога працэсу творчасці мастака. А.м. садзейнічала развіццю дызайну, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, паўплывала на развіццё тэатра і кінамастацтва, новых яго відаў і кірункаў (*оп-арт*, *поп-арт*, *мінімалізм* і інш.).

**АБСТРА́КТНАЯ ТО́ЕСНАСЦЬ,** гл. ў арт. *Тоеснасць*.

**АБСТРА́КЦЫЯ** (ад лац. abstractio адцягненне), метад навук. даследавання, заснаваны на мысленным вылучэнні істотных уласцівасцяў і сувязяў, агульнай адзнакі, якая характарызуе пэўны клас прадметаў і адцягненні ад інш. прыватных яго ўласцівасцяў і сувязяў; вынік працэсу абстрагавання, сінонім «мысленнага», «паняційнага». За кошт такога звужэння (спрашчэння) мадэлі аб'екта адкрываецца магчымасць пазнання фундаментальных бакоў і сувязяў у параўнанні з зыходнай мадэллю. Ступень абстрактнасці паняцця расце адпаведна павелічэнню яго аб'ёму і звужэнню зместу, што забяспечвае больш глыбокае пранікненне думкі ў аб'ект. Даволі абстрактныя паняцці, зведзеныя ў лагічна ўпарадкаваныя сістэмы, з'яўляюцца не толькі адлюстраваннем фундаментальнага парадку свету, але і лагічнымі, універсальнымі формамі думкі (напр., *філасофія*). На розных ступенях пазнання і культуры А. не заўсёды існуе ў сваёй уласнай форме; нават у народаў з развітой культурай у паўсядзённай свядомасці пераважаюць паняцці наглядна-эмпірычнага характару. Павышэнне ўзроўню абстрактнасці паняццяў, з якіх фарміруецца сістэма ведаў, — паказчык развітасці і тэарэтычнага ўзроўню навукі, яе практычнай эфектыўнасці. Часам тэрмін «А.» выкарыстоўваюць для абазначэння адарванасці навукі ад практыкі і рэчаіснасці (уласцівы абстрактна-лагічнаму «вобразу» свету). Аднак мера А. змяншаецца разам з дэталізацыяй і ростам сістэмнасці «вобраза». Паслядоўна разгортваючыся ў абстрактна-лагічных сістэмах, пазнанне праходзіць свой асаблівы шлях, накіраваны да канкрэтнага, да свету законаў, якія кіруюць бясконцай разнастайнасцю прадметаў і з'яў. На веданні такіх законаў *аб'ектыўнай рэальнасці* трымаецца ў канчатковым выніку ўвесь прагрэс чалавецтва.

У залежнасці ад мэтавай характарыстыкі вылучаюць некалькі відаў А.: А. атаясамлівання (абстрагаванне ад уласцівасцяў рэчаў, якія адрозніваюцца паміж сабой, і вылучэнне аднолькавых, падобных, агульных, тоесных уласцівасцяў); ізаляцыйная А. (вычляненне з'явы, якая даследуецца з пэўнай цэласнасці); абагульняльная А. (дае абагульненую карціну з'явы); А. актуальнай бясканечнасці (абумоўлівае магчымасць абстрагавання ад незавершанасці і незавяршальнасці працэсу ўтварэння бясконцых мностваў і аперыравання імі на аснове законаў і правілаў матэматыкі і логікі); А. патэнцыяльнай ажыццяўлімасці (абстрагаванне ад канструктыўных магчымасцяў чалавека і прыняцце рэальнай ажыццяўлімасці

Да арт. **Абстрактнае мастацтва.** П.Мондрыян. Кампазіцыя. 1930.



Да арт. **Абстрактнае мастацтва.** Дж. Полак. Лічба 1. Фрагмент. 1950.

Да арт. **Абстрактнае мастацтва.** В.Кандзінскі. Эскіз I да «Кампазіцыі VII». 1913.

пэўных крокаў). Сучасны наміналізм пазітывісцкага кірунку адмаўляе неабходнасць для навукі абстракцый высокіх узроўняў, чым пазбаўляе яе важнейшых сродкаў адлюстравання рэчаіснасці і патэнцыяльных магчымасцяў. У *дыялектычнай логіцы* слова «А.» ўжываецца таксама як паняцце «аднабаковае», «неразвітое», у адрозненне ад канкрэтнага (гл. *Абстрактнае і канкрэтнае*).

*Літ.*: Лазарев Ф.В. О природе научных абстракций. М., 1971; Новосёлов М.М. Абстракция и научный метод // Логика научного познания. М., 1987; Зуев Ю., Широканов Д. Генезис логических форм «единично-общее» и процедура обобщения // Принципы единства и развития в научном познании. Мн., 1988. *А.В.Ягораў.*

**АБСТРАКЦЫЯНІ́ЗМ**, творчы метад, паводле якога гал. задача маст. творчасці — выяўленне чыста суб'ектыўных эмоцый, падсвядомых імпульсаў, «ачышчаных ад рэальнасці» духоўных сутнасцяў. Філас. аснова А. яднае ў сабе паасобныя ідэі *інтуітывізму*, *пазітывізму*, *суб'ектыўнага ідэалізму*, *махізму* і інш. Эстэтычнае крэда А. выкладзена ў кнізе В.В.Кандзінскага «Аб духоўным у мастацтве» (1910), паводле якога для выяўлення прыгожага сучаснае мастацтва дае мастаку неабмежаваныя магчымасці — ад «чыстага рэалізму» да «чыстай абстракцыі». Найб. шырокае развіццё А. атрымаў у жывапісе, графіцы, архітэктуры, скульптуры, дэкар. мастацтве, а таксама ў дызайне, у афарміцельскім мастацтве, у тэатры, кіно, на тэлебачанні (гл. *Абстрактнае мастацтва*).

**АБСТРУ́КЦЫЯ** (ад лац. obstructio перашкода, забарона), від пратэсту, метад барацьбы, дзеянні, учынкі асоб ці калектываў, накіраваныя на зрыў якога-небудзь мерапрыемства, прапановы. Найб. пашырана ў парламентах — доўгія прамовы, якія не маюць дачынення да справы.

**АБСТЭ́РНА**, возера ў Беларусі, у Міёрскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Вята. Уваходзіць у *Абстэрнаўскую групу азёраў*. Пл. 9,89 км$^2$. Даўж. 5,5 км, найб. глыб. 12 м. Пл. вадазбору каля 115 км$^2$.

Берагі пясчаныя. Дно складанай будовы, выслана пяском і сапрапелямі. Схілы пераважна высокія, укрытыя лесам, на У разараныя. Злучана ручаём з воз. Укля, пратокамі з азёрамі Важа і Набіста. У 1967 узровень яго штучна падняты на 1 м.

**АБСТЭ́РНАЎСКАЯ ГРУ́ПА АЗЁРАЎ**, у Беларусі, на мяжы Браслаўскага і Міёрскага р-наў Віцебскай вобл., у бас. р. Вята, паміж адгор'ямі Браслаўскай марэннай грады і Полацкай азёрна-ледавіковай нізінай. Уключае 13 азёраў (агульная пл. 32 км$^2$), злучаных сістэмай мелкаводных забалочаных праток; найб. *Абстэрна*, *Укля*, *Набіста*, *Важа*, *Інава*. Дрэніруюцца р. Хараброўка, якая пачынаецца з воз. Набіста, цячэ праз воз. Шчоўна, выцякае з яго пад назвай Вята. З У прымыкае гідралагічны заказнік Балота мох. Плацінай на Хараброўцы ўзровень вады азёраў падняты на 0,8—1 м з утварэннем адзінага воднага басейна. Прамысловае рыбалоўства. Турызм.



Возера Абстэрна.

**АБСЦЫЗА́ВАЯ КІСЛАТА́**, гармон раслін. Па хім. будове *ізапрэноід*. Рэгулюе працэсы завядання і ападання ліста (паскарае ўтварэнне аддзяляльнага слоя), тармозіць рост адрэзкаў сцяблоў і калеоптыляў. Біясінтэз А.к. і гармонаў росту — гіберэлінаў — адбываецца ў раслінах з мевалонавай к-ты. Мяркуюць, што сістэма біясінтэзу А.к. або гіберэлінаў рэгулюецца лішкам аднаго з гэтых прадуктаў. Прэпарат А.к. выкарыстоўваецца для вывучэння тармажэння працэсаў росту.

**АБСЦЭ́С** (ад лац. abscessus нарыў), мясцовае намнажэнне гною, якое су-

праваджаецца мясцовым распадам тканак і ўтварэннем у іх гнойнай поласці, абмежаванай абалонкай. Развіваецца пры пранікненні гнаяродных мікробаў у тканкі пры траўмах, а таксама пры ўздзеянні на тканкі некат. рэчываў (шкіпінару, кратонавага алею, сулемы і інш.). Мікробы з першапачатковага ачага могуць распаўсюджвацца па лімфатычных і крывяносных сасудах у суседнія тканкі і аддаленыя органы (скуру, лёгкія, печань, ныркі, галаўны мозг, мышцы і інш.) і выклікаць фарміраванне ў іх другасных А. Бывае востры, хранічны, паверхневы, халодны.

**АБСЦЭ́СЫ МНО́ЖНЫЯ** ў д з я ц е й, п с е ў д а ф у р у н к у л ёз, хвароба, якая характарызуецца гнойным запаленнем экрынавых потавых залоз. Узбуджальнік — залацісты стафілакок. Узнікненню спрыяюць расшыраныя і ўкарочаныя вывадныя пратокі потавых залоз у грудных дзяцей. На скуры ў вусцях пратак з'яўляюцца пустулы (як шпілечная галоўка), якія прарываюцца з утварэннем гнойнай скарынкі. Адначасова ўзнікаюць шматлікія вузельчыкі і вузлы (памерам ад гарошыны да яйца) чырвона-бардовага колеру, якія потым размнажаюцца і прарываюцца з вадкім гноем. Высыпанні бываюць прыступамі і суправаджаюцца агульнай слабасцю, ліхаманкай, паносам. Хвароба працяглая; пры загойванні застаюцца рубцы. Лечаць УФ-апрамяненнем, пераліваннямі крыві маці, ін'екцыямі пеніцыліну; абсцэсы ўскрываюць, прамываюць антысептыкамі.

**АБТУРА́ТАР** (франц. obturateur ад лац. obturare зачыняць), 1) прылада, з дапамогай якой у кінаапаратах перыядычна (на час, неабходны для змены кадра) перакрываецца светлавы паток, а таксама ажыццяўляецца *мадуляцыя святла* ў некаторых оптыка-мех. і фотаэл. прыборах. Адрозніваюць А. з вярчальным рухам — дыскавыя, конусныя, цыліндрычныя і са зваротна-паступальным— шторныя; з люстраным пакрыццём або без яго. А. мае светлавыя адтуліны, праз якія святло праходзіць да кінаплёнкі. 2) Пругкі элемент у затворах гармат, які прыціскаецца пры выстрале да сценкі камеры і прадухіляе прарыў парахавых газаў.

**АБТУРА́ЦЫЯ**, герметызацыя канала ствала пры выстрале для прадухілення прарыву парахавых газаў. Забяспечвае дальнабойнасць і бяспечнасць стральбы. У зброі з патронным зараджаннем А. дасягаецца выкарыстаннем латуннай гільзы, якая расшыраецца пры выстрале і забяспечвае герметызацыю ствала з боку затвора. У артыл. гарматах з бязгільзавым зараджаннем А. ажыццяўляецца з дапамогай *абтуратара*. Прарыву газаў у бок руху снарада перашкаджаюць вядучыя паяскі снарадаў і абалонкі куль, у мінамётах — канаўкі на цыліндрычнай частцы міны.

**АБУ́-БАКА́Р** (А б а к а р а ў) Ахмедхан (н. 12.12.1931, аул Кубачы, Дагестан), даргінскі пісьменнік. Нар. пісьменнік Дагестана (1969). Скончыў Літ. ін-т імя Горкага (1956). Аўтар аповесцяў «Даргінскія дзяўчаты» (1958), «Каралі для маёй Серміназ» (1965), «Сонца ў «Арліным гняздзе» (1975), «Мама, запалі сонца» (1983) і інш. Нац. каларыт у яго творах падкрэсліваюць шматлікія фалькл. элементы (прытчы, легенды, анекдоты). Выступае як драматург, кінадраматург, піша для дзяцей.

*Тв.:* Избранное. Махачкала, 1971; Бел. пер.— Дзяўчына з крэпасці; Сонца ў «Арліным гняздзе». Мн., 1979.

**АБУ́-БЕКР**, А б д а л а х і б н А с м а н (572 ці 573 — жн. 634), першы халіф [632—634] у Араб. халіфаце. Адзін з бліжэйшых паплечнікаў *Мухамеда*, разам з ім перасяліўся ў *Медыну* (622). Абраны халіфам пасля смерці Мухамеда. Задушыў паўстанні араб. плямёнаў, сепаратысцкія рухі ў Аравіі. Ваяваў супраць сасанідскага Ірана (633) і візантыйцаў у Палесціне (634).

**АБУ́ БЕКР КЕЛЕВІ́** (?—1366), рамеснік, адзін з кіраўнікоў руху *сербедараў* у Самаркандзе ў 1365—66. У 1365 пасля ўцёкаў эміра з Самарканда арганізаваў абарону горада ад хана *Магалістана* Ільяс-Ходжы і прымусіў яго адступіць. Пасля вяртання эміра быў хітрасцю захоплены і пакараны смерцю.

**АБУ́-ДА́БІ**, А б у - З а б і, горад, сталіца *Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў* і эмірата Абу-Дабі. 328 тыс. ж. (1992). Размешчаны на прыбярэжным востраве Персідскага зал., які злучаны з мацерыком дамбамі і мастамі. Буйны прамысл., культ. і гандл. цэнтр, другі па велічыні порт краіны. Вузел аўтадарог. Міжнар. аэрапорт. Цэнтр нафтаздабычы. Нафтаперапр. і газаперапр. прам-сць; цэментны, металургічны, пластмасавых труб з-ды; прадпрыемства па апрасненні вады. Суднабудаванне. Рыбалоўства.

**АБУ́ДЖА** (Abuja), горад, новая федэральная сталіца *Нігерыі*. Перанесена з г. Лагас у 1976. Будуецца ў цэнтр. частцы краіны. 230 тыс. ж. (1991).

**АБУЛА́ДЗЕ** Тэнгіз Яўгенавіч (31.1.1924—6.3.1994), грузінскі кінарэжысёр. Нар. арт. Грузіі (1970), нар. арт. СССР (1980). Скончыў Усесаюзны дзярж. ін-т кінематаграфіі (1953). Майстар тонкага псіхал. малюнка, валодаў уменнем лаканічна і пераканаўча стварыць вобраз часу. Аўтар ці сааўтар сцэнарыяў большасці сваіх фільмаў, адметных высокай выяўл. культурай: «Лурджа Магданы» (разам з Р.Чхеідзе), «Я, бабуля, Іліко і Іларыён», «Чужыя дзеці», «Каралі для маёй любай», трылогіі «Мальба», «Дрэва жадання», «Пакаянне» (1969—87, Ленінская прэмія 1988).

**АБУЛІ́Я** (ад *a*... + грэч. bulē воля), паталагічнае парушэнне псіхічнай рэгуляцыі дзеянняў, слабаволле, нерашучасць. Выяўляецца ў адсутнасці імкнення да дзейнасці, у няздольнасці прыняць рашэнне і ажыццявіць дзеянне, хоць неабходнасць яго ўсведамляецца. Назіраецца пры меланхоліі, іпахондрыі, неўрастэніі, можа быць выклікана таксама барацьбой уяўленняў і пачуццяў, пераканаццем у марнасці ўсякага дзеяння. А. трэба адрозніваць ад слабаволля як рысы характару (гл. *Воля*).

**АБУ́-ЛЬ-АЛА́ ГАНДЖЭВІ́** (А б у - л ь - У л а Г а н д ж э в і) Махмуд Нізамеддзін, азербайджанскі паэт 1-й пал. 12 ст. Пісаў на мове фарсі. Услаўляў феад. правіцеляў і іх прыбліжаных. Аўтар шматлікіх вершаў (пераважна ў жанры касыды), якія вызначаліся высокім паэтычным майстэрствам, адточанасцю і выразнасцю формы.

**АБУ́-ЛЬ-ГАЗІ́** Бахадур-хан (12.8.1603, г. Ургенч, Узбекістан — сак. 1664), узбекскі пісьменнік, гісторык. Хівінскі хан. У творах («Радаслоўная туркменаў» і «Радаслоўнае дрэва цюркаў») ёсць каштоўныя звесткі пра жыццё і гісторыю розных плямёнаў Сярэдняй Азіі, шэраг

Горад Абу-Дабі.

нар. легендаў, паданняў, прымавак і прыказак.

*Літ.*: Кононов А.Н. Родословная туркмен: Соч. Абу-л-Гази хана хивинского. М.; Л., 1958.

**АБУЛЬГАСА́Н** (сапр. Алекперзадэ Абульгасан Алібаба аглы; 12.3.1906, с. Баскал, Азербайджан — 1986), азербайджанскі пісьменнік. Нар. пісьменнік Азербайджана (1979). Скончыў Бакінскі пед. ін-т (1932). Раманы «Свет разбураецца» (1933), «Бастыёны дружбы» (кн. 1—4, 1950—70), «Садагат» (1979) і інш. сюжэтна звязаны з падзеямі рэвалюцыі, грамадз. і Вял. Айч. войнаў. Аўтар сатыр. аповесці «Унукі старой Тамашы» (ч. 1—3, 1957—69), шматлікіх апавяданняў.

*Тв.*: Бел. пер. — Унукі старой Тамашы. Мн., 1962.



Калосы Рамсеса II у Абу-Сімбеле.

**АБУ́-ЛЬ-ФА́РАДЖ АЛЬ-ІСФАХА́НІ** (сапр. Алі ібн Хусейн ібн Мухамед інб Ахмед аль-Курашы; 897, г. Ісфахан, Іран — 21.11.967), арабскі паэт, вучоны. Сакратар і прыдворны паэт буідскіх правіцеляў. Вывучаў стараж. гісторыю, генеалогію, фізіялогію, паэзію. Асн. твор (працаваў над ім каля 50 гадоў) «Кніга песень» — анталогія арабскай і арабамоўнай паэзіі 7—10 ст., кашт. крыніца звестак па гісторыі л-ры і культуры Араб. халіфата. У «Кнізе падарожжаў» сабраў вершы і анекдоты за перыяд з 786 да 902.

**АБУ́ МУСЛІ́М** (каля 727—755), кіраўнік паўстання 747—750 у Харасане супраць *Амеядаў*, якое прывяло да ўлады *Абасідаў*. У юнацтве быў рабом. Пасля рашаючай перамогі над амеядскім войскам у 750 на р. Вялікі Заб — намеснік Харасана. Забіты па загадзе абасідскага халіфа *Мансура*.

**АБУ́ НУВА́С** (паміж 747 і 762, г. Ахваз, Іран — паміж 813—815), арабскі паэт. Жыў пры двары абасідскіх халіфаў у Багдадзе. Адзін з герояў кн. «Тысяча і адна ноч». Пісаў хвалебныя прыдворныя касыды, пародыі на традыц. жанры араб. паэзіі і багаслоўскія хадысы. Праціўнік бедуінскага «псеўдакласіцызму», распрацоўваў новыя тэмы і сюжэты (гарадское жыццё, забароненае ісламам віно, паляванне і інш.). Аўтар лірычных імправізацый, што апяваюць каханне і пачуццёвыя ўцехі (цыкл «Хамрыят»), богазневажальных і прасякнутых духам аскетызму вершаў (цыкл «Зухдзіят»), сатыраў, пяшчотных вытанчаных песень, прысвечаных нявольніцы Джынане. У яго вершах сустракаюцца

Да арт. Абутак. Скураны абутак 12—13 ст. з раскопак Полацка, Мінска, Гродна.



Да арт. Абутак. Асноўныя дэталі мужчынскага рантавага паўчаравіка: *1* — падэшва; *2* — рант; *3* — цвёрды насок; *4* — верх; *5* — асноўнае палатно; *6* — прасцілка; *7* — вусцілка; *8* — укладная паўсцілка; *9* — абцас; *10* — заднік; *11* — набойка; *12* — берац; *13* — сашэўка; *14* — насок.

імёны іранскіх гіст. і фальклорных герояў, апісанне звычаяў і традыцый зараастрызму.

*Літ.*: Шидфар Б.Я. Абу Нувас. М., 1978.

**АБУ́-САФА́**, нафтавае радовішча ў Саудаўскай Аравіі і Бахрэйне, адно з буйнейшых у свеце. У акваторыі Персідскага зал., за 50 км на ПнУ ад порта Рас-Танура. Уваходзіць у *Персідскага заліва нафтагазаносны басейн*. Адкрыта ў 1963, распрацоўваецца з 1966. Пачатковыя прамысл. запасы нафты 561 млн. т. Прадукцыйныя залежы на глыб. 2 км. Шчыльн. нафты 876 кг/м$^3$. Свідравіны фантануючыя. Падводны нафтаправод у порт Рас-Танура.

**АБУ́-СІМБЕ́Л**, мясцовасць на зах. беразе Ніла, каля г. Асуан у Егіпце. У 1-й пал. 13 ст. да н.э. тут высечаны 2 скальныя храмы фараона Рамсеса II і гал. стараж.-егіпецкіх багоў са статуямі і рэльефамі на фасадах і ў інтэр'ерах. На фасадзе гал. храма 4 велічныя (20-метровыя) сядзячыя калосы Рамсеса II. У сувязі з буд-вам Асуанскай плаціны ў 1967 яны перанесены на плато над старым рэчышчам Ніла.

**АБУ́ТАК**, на Беларусі гарбарна-шавецкае рамяство (гл. *Гарбарства*) як самастойная галіна існуе з часоў Полацкага княства. Стараж. майстэрні па апрацоўцы скуры і вырабу А. археолагі выявілі ў Полацку, Мінску, Пінску. Асн. тагачаснымі тыпамі А. гараджан былі поршні, чаравікі, *боты*. Магнаты, гарадская знаць насілі А. з дарагіх матэрыялаў, вытанчаных формаў, упрыгожаны спражкамі, бантамі і інш. Выпрацоўка новых формаў залежала ад маст. рысаў усяго ансамбля *адзення*, развівалася ў агульным еўрап. стылі. Нар. А. вырабляліў хатніх умовах або спец. рамеснікі — шаўцы. Ён бытаваў у вёсках і дробных мястэчках і лепш, чым А. гараджан, стасаваўся з прыродна-кліматычнымі ўмовамі, спецыфікай працы насельніцтва. Самы стараж. тып А. беларусаў складаўся з абгортак, прывязак і ўласна А. Абгорткі (анучы, завойкі) — 2 полкі белага палатна, якімі абгортвалі ногі. Абгортка ног да шчыкалатак кавалкам палатна пры хадзе басанож была пашырана сярод жанчын, асабліва ў час жніва. Прывязкі (аборы, валокі) вілі з пянькі, лёну, канапель, конскага воласу, наразалі з сырамятнай скуры. Мацавалі абгорткі па-рознаму: на Тураўшчыне і Мазыршчыне доўгія прывязкі ўтваралі своеасаблівую вяровачную панчоху, на Пн Беларусі былі кароткія і абкручваліся да шчыкалатак. Уласна А. у мінулым — плеценыя ці скураныя вырабы. Нязначнае пашырэнне мелі *дзеравяшкі*. Асн. від плеценага А., які бытаваў да пач. 20 ст., — *лапці* (шчарбакі, кавярзні). Іх плялі з лазовай і вязавай кары (лыка), пянькі. Скураны А. быў 2 відаў: шыты з аднаго кавалка скуры — *пасталы* і з прышытымі падэшвамі і абцасамі — боты, чаравікі. Майстэрствам вырабу ботаў у 19 — пач. 20 ст. славіліся шаўцы навакольляў Турава, Давыд-Гарадка, Петрыкава, Слуцка і інш. На святы жанчыны абувалі і чаравікі (боцікі, *шнуроўкі*). Валены А. (*валёнкі*) набыў пашырэнне ў 19 ст., бытуе і цяпер. Гумавы А. пачалі насіць у 1930-я г. Бахілы (глыбокія галошы) надзявалі звычайна на буркі.

Сучасны А. падзяляюць на бытавы, вытворчы, спартыўны і медыцынскі (гл. *Абутак артапедычны*). Паводле канструкцыі загатовак адрозніваюць боты, чаравікі, паўчаравікі, туфлі і інш. Падзяляецца на групы: пінеткі (памер, ці даўжыня ступні, 95—125 мм), гусарыкі (120—140), маладзіцячы (145—175),

дзіцячы (180—200), школьны (205—225), дзявочы (230—250), хлапечы (230—255), жаночы (215—275), мужчынскі (245—305). Паўната (абхват ступні) — ад 1 да 10 умоўных адзінак (найб. пашыраная 6 і 7).

Дэталі верху і нізу А. злучаюцца ніткамі, шпількамі, цвікамі, вінтамі, клеем (пераважна сінтэтычным), вулканізацыяй, ліццём. Вонкавыя дэталі верху робяць з натуральнай ці штучнай скуры, тэкстыльных матэрыялаў; дэталі нізу — са скуры, гумы (порыстай, нянепорыстай, скурападобнай), пластмасаў (напр., поліурэтану) і інш. А. павінен мець цеплаахоўныя ўласцівасці, быць водаўстойлівым, паветра- і паранепранікальным. Тэхналогія вырабу А. ўключае раскрой матэрыялаў на дэталі, іх апрацоўку, выраб загатовак верху і фармаванне іх на калодцы, прымацаванне нізу да верху, аддзелку. Прамысловы раскрой робяць разакамі на электрагідраўл. ці мех. прэсах, спец. аўтаматах. З дапамогай ЭВМ разлічваюць аптымальныя варыянты ўкладкі дэталяў на матэрыяле. Дэталі верху скошваюць, загінаюць, апрацоўваюць; дэталі нізу выраўноўваюць па таўшчыні, фрэзеруюць, скошваюць, шліфуюць. Дэталі верху злучаюць у плоскія загатоўкі, якім надаюць аб'ёмную форму: увільгатняюць (часам награваюць), расцягваюць удоўж і ўпоперак, зацягваюць і прымацоўваюць загатоўкі да вусцілкі. Затым змацоўваюць верх і ніз і робяць канчатковую апрацоўку (абразанне залішняга матэрыялу, афарбоўку, паліраванне і інш.). Гл. таксама *Абутковая прамысловасць.*

*М.Ф.Раманюк (гістарычная частка).*

**АБУ́ТАК АРТАПЕДЫ́ЧНЫ**, спецыяльны абутак для людзей з дэфармаванымі ступнямі і ступнямі з функцыянальным дэфектам. Дапамагае выправіць пач. няўстойлівую дэфармацыю ступні, кампенсаваць пакарачэнне канечнасці, павялічыць плошчу апоры, падтрымаць звод ступні, вызваліць балючыя месцы ад нагрузкі, зрабіць канечнасць апорнай, калі дэфармацыю нельга ліквідаваць хірург. метадамі. Паказанні для нашэння: плоскаступнёвасць, пакарачэнне ступні і канечнасці; касалапасць, паралітычныя дэфармацыі ступняў, аплікозы галёнкаступнёвага сустава; хранічныя ацёкі і інш. А.а. носяць таксама на артапедычных апаратах, гіпсавых павязках і пратэзах. Выраблюецца ён індывідуальна пад кантролем урача.

Просты А.а. мала адрозніваецца ад звычайнага; складаны мае спец. канструкцыю верху і нізу. Адной з гал. частак А.а. з'яўляецца пластычная вусцілка (супінатар), якую выраблюць па злепку са ступні. Верх. А.а. ўмацоўваюць «падтрымкамі» або цвёрдымі паўгарсэтамі. Вышыню верху пры паралічы мышцаў галёнкі павялічваюць да палавіны лыткі. На Беларусі выраблюць і рамантуюць А.а. на Мінскім пратэзным з-дзе і ў пратэзных майстэрнях абл. цэнтраў.

*А.У.Руцкі.*

**АБУТКО́ВАЯ ПРАМЫСЛО́ВАСЦЬ**, галіна *лёгкай прамысловасці*, якая выраблюе *абутак* са скуры і інш. матэрыялаў. У прамысл. развітых краінах працэс механізацыі абутковай вытв-сці пачаўся ў 1850-я г. з выкарыстаннем швейных і інш. спец. машын для механізаванага вырабу абутку.

Сусветная вытв-сць скуранога абутку складае 9,7 млрд. пар штогод, з іх 12% (1,05 млрд.) у краінах ЕЭС. Вядучыя фірмы на сусв. рынку: «Кларк» (Вялікабрытанія), «Баця Інтэрнэшанал» (Канада), «Адзідас», «Саламандэр» і «Пума» (Германія). А.п. Беларусі пачала фарміравацца ў пач. 20 ст. з дробных шавецкіх майстэрняў. Механічная ф-ка «Арол» у Мінску выпускала 800 пар абутку за суткі (1913), дзейнічалі таксама 2 ф-кі рус.-амер. і рус.-бельг. акц. т-ваў і абутковыя майстэрні ў Віцебску. У 1921 А.п. выпускала каля 14 тыс. пар абутку за год. У 1920—30-я г. пачалі дзейнічаць абутковыя ф-кі «Праца» ў Гомелі, «Прагрэс» у Віцебску, механізаваная ф-ка імя Калініна і ф-ка імя Тэльмана ў Мінску і інш. Да пач. Вял. Айч. вайны дзейнічала 12 высокамеханізаваных фабрык, якія выраблялі 9,8 млн. пар абутку (1940). У Вял. Айч. вайну ўсе прадпрыемствы разбураны. У 1952 А.п. дасягнула даваен. ўзроўню вытв-сці. Макс. вытв-сць скуранога абутку на Беларусі дасягнута ў 1988 (46,9 млн. пар). У 1993 выпуск абутку скараціўся да 13,3 млн. пар. Самыя буйныя прадпрыемствы А.п. ўваходзяць у дзярж. канцэрн па вытв-сці і рэалізацыі тавараў лёгкай прам-сці «Беллегпрам» (Мінскае абутковае адкрытае акц. т-ва «Прамень», акц. т-ва «Гроднаабутак», акц. т-ва Віцебская абутковая ф-ка «Чырвоны Кастрычнік», Лідская абутковая ф-ка, Гомельскае вытв. абутковае аб'яднанне «Праца», Бабруйская абутковая ф-ка, акц. т-ва «Баранавіцкая абутковая ф-ка» і інш.). Створаны сумесныя абутковыя прадпрыемствы з Германіяй: у Віцебску — «Белвест» (1988), у Мінску — «Отыка» (1993).

Абутылон Тэафраста.

*В.М.Лагвінко.*

**АБУТЫЛО́Н**, канатнік (Abutilon), род адна- і шматгадовых раслін сям. мальвавых. Больш за 100 відаў. Пашыраны пераважна ў тропіках і субтропіках. Ад Міжземнамор'я да ўсх. ўзбярэжжа Азіі расце А. Тэафраста, або кітайскі джут (A. theophrasti). З яго валакна выраблюць пражу, мешкавіну, шпагат, вяроўкі і інш. Алей з насення прыдатны на мылаварэнне, вытв-сць пакосту і інш. Завезены ў Паўн. Амерыку і Аўстралію. На Беларусі трапляецца як рэдкая заносная расліна; у пакоях, аранжарэях вырошчваюць прыгожы квітучы А. гібрыдны (A. hybridum).

Травы, кусты і зрэдку невял. дрэвы выш. да 4 м. Кветкі буйныя, адзіночныя або ў пазушных суквецціях, многія віды апыляюць

Н.А.Абухава.

калібры. Плод з некалькіх пладовак, якія маюць па некалькі зярнят.

**АБУ́ХАВА**, вёска ў Беларусі, у Гродзенскім р-не. Цэнтр сельсавета і с.-г. калект. прадпрыемства «Абухава». За 18 км на ПдУ ад Гродна, 1,5 км ад чыг. ст. Жыдомля. 1702 ж., 521 двор (1994). Калектыўнае с.-г. і гандл. прадпрыемствы, лазнева-пральны камбінат, станцыя тэхн. абслугоўвання. Сярэдняя, муз. і спарт. школы, Палац культуры, б-ка, дзіцячы сад, амбулаторыя, аддз. сувязі, ашчадны банк, гандлёвы цэнтр.

**АБУ́ХАВА** Лідзія Аляксееўна (17.8.1922, г. Кутаісі — 26.4.1991), рус. пісьменніца. Скончыла Літ. ін-т імя Горкага (1951). Людзям Палесся прысвечана яе аповесць «Глыбінь-гарадок» (1955, бел. пер. 1958), 1000-годдзю Віцебска — кн. «Віцьбічы» (1974); Ю.Гагарыну — аповесці «Любімец стагоддзя» (1972) і «Спачатку была Зямля...» (1973). Аўтар дакумент. аповесцяў «Сярэбраная кніга Поўначы» (1968) і «Пагранічныя характары» (1978).

**АБУ́ХАВА** Надзея Андрэеўна (6.3.1886, Масква — 14.8.1961), рус. спявачка (мецца-сапрана), выдатная прадстаўніца рус. вакальнай школы. Нар. артыстка СССР (1937). Скончыла Маскоўскую кансерваторыю (1912). У 1916—48 салістка Вял. т-ра СССР. Валодала голасам багатага тэмбру, шырокага дыяпазону. Выконвала кантральтавыя і высокія мецца-сапранавыя партыі. Лепшыя з іх: Любаша («Царская нявеста» М.Рымскага-Корсакава), Марфа («Хаваншчына» М.Мусаргскага), Кармэн («Кармэн» Ж.Бізэ) і інш. Дзярж. прэмія СССР 1943.

*Літ.*: Полянovский Г. Н.А.Обухова. 2 изд. М., 1986.

**АБУ́ХАЎ** Віктар Цімафеевіч (19.1.1900, с. Нікольскае Арэнбургскага р-на — 26.11.1975), удзельнік баёў на Беларусі ў Вял. Айч. вайну, Герой Сав. Саюза

(1944), ген.-палк. танкавых войскаў (1954). Скончыў Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1934). На фронце з чэрв. 1941, камандзір 26-й танк. дывізіі, якая дыслацыравалася на Беларусі. Механізаваны корпус пад камандаваннем ген.-маёра А. вызначыўся ў чэрв.—ліп. 1944 пры фарсіраванні Бярэзіны, акружэнні мінскай групоўкі праціўніка, вызва-

Г.Б.Абуховіч.

ленні Вілейкі, Маладзечна, Смаргоні і Вільні.

**АБУ́ХАЎ** Генадзь Аляксеевіч (н. 18.6.1924, чыг. ст. Сляпцоўская Сунжэнскага р-на, Чэчня), бел. вучоны ў галіне псіхіятрыі. Д-р мед. навук (1973), праф. (1974). Засл. ўрач Беларусі (1975). Скончыў Паўн.-Асецінскі мед. ін-т (1949). Працаваў у Маскве, Іране, Кішынёве. З 1962 у Гродзенскім мед. ін-це. Даследаванні ў галіне пагранічнай псіхіятрыі і алкагольнага псіхозу.

*Тв.*: Пневмоэнцефалография при шизофрении. Кишинев, 1968 (разам з Г.І. Брэгман, В.М.Міхліным).

**АБУХО́ВІЧ** Альгерд Рышардавіч (псеўд. Граф Бандынэлі; 6.8.1840, в. Калацічы Глускага р-на Магілёўскай вобл. — 22.8.1898), бел. пісьменнік. Вучыўся ў Слуцкай гімназіі. Падарожнічаў, жыў у Жэневе, Парыжы. Паводле некат. звестак удзельнічаў у паўстанні 1863—64. Перакладаў творы А.Пушкіна, М.Лермантава, А.Міцкевіча, М.Канапніцкай, У.Сыракомлі, І.В.Гётэ, Ф.Шылера, В.Гюго, Дж.Байрана, Дантэ (распаўсюджваліся ў рукапісах). З Ф.Багушэвічам (былі знаёмыя) пачынальнік жанру байкі ў бел. л-ры. Аўтар баек «Ваўкалак» (праблема свабоды чалавечай асобы), «Старшына» (паліт. сатыра на паслярэформенную Рас. імперыю), «Суд», «Воўк і лісіца», верша «Дума а Каралю XII». Мемуары А. (1894, фрагменты надр. ў 1916 у віленскай газ. «Гоман») — яркі помнік эпохі з цікавым зместам, жывою моваю.

*Тв.*: Творы. Мн., 1991.

*Літ.*: Родчанка Р. Альгерд Абуховіч-Бандынэлі: Нарыс жыцця і творчасці. Мн., 1984. *Г.В.Кісялёў.*

**АБУХО́ВІЧ** Ганна Браніслававўна (5.12.1908, Масква — 13.11.1986), бел. актрыса. Нар. арт. Беларусі (1944). Скончыла курсы «Кіно-Поўнач» у Ленінградзе (1929). Сцэн. дзейнасць пачала ў тэатрах Масквы. З 1937 у Дзярж. рус. драм. т-ры Беларусі. Стварыла шэраг яркіх, псіхалагічна глыбокіх драм. вобразаў. Сярод лепшых роляў: Ларыса і Агудалава («Беспасажніца» А.Астроўскага), гаспадыня Ніскавуоры («Каменнае гняздо» Х.Вуаліёкі), Ганерылья («Кароль Лір» У.Шэкспіра), цётухна Руца («Птушкі нашай маладосці» І.Друцэ), Надзея Пятроўна («Брэсцкая крэпасць» К.Губарэвіча), Міхаліна Матулевіч («Трывога» А.Петрашкевіча). Аўтар успамінаў «Паўстагоддзя на сцэне» (1987).

**АБУХО́ВІЧ** Міхал Лявон (?—22.10.1668), дзярж. і ваенны дзеяч ВКЛ, мемуарыст. Сын П.К.*Абуховіча*. Скончыў філас. ф-т Віленскай акадэміі. Служыў пры двары караля Яна Казіміра Вазы. Палкоўнік войска ВКЛ, падкаморы мазырскі (1662), навагрудскі (1665), стражнік ВКЛ (1668). Каралеўскі дыпламат, ганец у Маскву (1650, 1653). У 1651 удзельнічаў у ваен. паходзе супраць Б.Хмяльніцкага, у 1656 ваяваў са шведамі пад Варшавай. Пасля смерці бацькі (1656) камандаваў яго палком. У 1660 пад час бітвы з рус. войскам І.Хаванскага на Брэстчыне трапіў у палон і вывезены ў Маскву (у 1662 абменены на рус. военачальнікаў у Смаленску). Удзельнічаў у паходзе на Браншчыну (1664). Аўтар панегірыкаў, 2 «Дыярыушаў» на польск. мове пра маскоўскія звычкі і традыцыі, сеймы Рэчы Паспалітай, паліт. атмасферу часу, ваен. акцыі, у якіх сам удзельнічаў.

*А.Ф.Коршунаў.*

**АБУХО́ВІЧ** Піліп Казімір (?—6.9.1656), дзярж. і ваенны дзеяч ВКЛ, дыпламат, пісьменнік. З роду *Абуховічаў*, паходжаннем з мазырскай шляхты, якая асела на Навагрудчыне. Скончыў Замойскую акадэмію (цяпер Люблінскае ваяв., Польшча). З 1649 пісар ВКЛ. Пасол у Венецыі і Маскве (1651). Ваявода віцебскі, смаленскі (1653). У 1654 узначальваў абарону Смаленска і пасля доўгай аблогі здаў горад рус. войскам. За гэта быў абвінавачаны ў здрадзе, але на сойме 1658 апраўданы. Яму адрасаваны «*Ліст да Абуховіча*». Аўтар вершаў на лац. мове. У 1617 у Замосці апубл. прамовы на лац. і грэчаскай мовах у гонар П.Замойскага. У «Дыярыушы» апісаў падзеі 1630—54: грамадска-паліт. жыццё Рэчы Паспалітай, у т.л. Беларусі, ваен. падзеі ў час антыфеад. вайны ўкр. і бел. народаў 1648—54, міжнар. адносіны ва Усх. Еўропе сярэдзіны 17 ст. і інш.

*А.Ф.Коршунаў.*

**АБУХО́ВІЧ** Тэадор Геранім (1643—14.4.1707), дзярж. дзеяч ВКЛ, мемуарыст. Сын П.К.*Абуховіча*. У 1657—69 пры двары караля Яна Казіміра Вазы. У 1672 і ў 1678—1700 неаднаразова выбіраўся паслом на соймы. У 1673 удзельнічаў у бітве пад Хоцінам супраць туркаў. Паломнічаў у Рым (1674). Падкаморы (1693) і кашталян (1700) навагрудскі. Аўтар «Дыярыуша», які ахоплівае падзеі грамадска-паліт. жыцця Рэчы Паспалітай 1656—1700.

**АБУХО́ВІЧЫ**, шляхецкі род герба «Ключ раздвоены» («Абуховіч») у ВКЛ. Найб. вядомыя:

Піліп Казімір, гл. *Абуховіч* П.К. Тэадор Міхал (?—1658), брат Піліпа Казіміра. Падкаморы мазырскі (1646), паручнік гусарскай харугвы, пасол соймавы. Валодаў землямі ў Мазырскім пав. Захарыяш (?—1658), брат Піліпа Казіміра, суддзя, дэкан смаленскі. Мікалай (?—?), скарбнік і суддзя гродскі мазырскі (1648). Міхал Лявон, гл. *Абуховіч* М.Л. Тэадор Геранім, гл. *Абуховіч* Т.Г.

**АБУЧА́ЛЬНАЯ МАШЫ́НА**, тэхнічная сістэма, якая часткова або поўнасцю выконвае функцыі выкладчыка ў працэсе *праграмаванага навучання*. Выдае порцыі матэрыялу, кантрольныя заданні ў паслядоўнасці, адпаведнай *абучальнай праграме*, у тэмпе, зручным для навучэнца; вызначае правільнасць выканання кантрольных заданняў, характар памылак, далейшую паслядоўнасць праходжання курса. Мадэлявальныя А.м. (трэнажоры) прызначаны для набыцця практычных навыкаў і трэніроўкі, калі ва ўмовах рэчаіснасці гэта звязана з вял. цяжкасцямі, эканамічна немэтазгодна або немагчыма, напр. пры навучанні касманаўтаў, вадзіцеляў трансп. сродкаў, аператараў складаных машын і агрэгатаў. Як А.м. можа выкарыстоўвацца ЭВМ.

**АБУЧА́ЛЬНАЯ ПРАГРА́МА**, апісанне працэсу *праграмаванага навучання*, якое змяшчае навуч. матэрыял, заданні для яго засваення, указанні па іх выкананні і кантролі. У залежнасці ад парадку падачы інфармацыі бывае лінейная або разгалінаваная. Афармляецца ў выглядзе невял. раздзелаў навуч. матэрыялу з кантрольнымі пытаннямі і ўказаннямі. Фіксуецца на кінаплёнцы, дыяпазітывах, у форме кнігі (праграмаваны падручнік), запісваецца на магн. плёнку (для ўзнаўлення праз магнітафон), уводзіцца ў памяць ЭВМ.

**АБУЧА́ЛЬНЫ КО́МПЛЕКС**, сукупнасць функцыянальна ўзаемазвязаных навуч.-метадычных, інфарм., матэм. і інж.-тэхн. сродкаў, якія забяспечваюць *праграмаванае навучанне*. Ствараецца на базе ЭВМ з разгалінаванай сістэмай прыстасаванняў для ўводу і вываду дадзеных, напр., *абучальных машын*.

**АБХА́ВА** (санскр. небыццё, неіснаванне), паняцце класічнай інд. філасофіі, якое ў шэрагу навук. школ азначае «адсутнасць», «знішчэнне», «адмаўленне», «смерць»; нярэдка разглядаецца як катэгорыя, процілеглая станоўчай бхаве (быццё, існаванне). У Канады, заснавальніка стараж.-інд. філас. сістэмы вайшэшыкі, А. процістаўляецца 6 станоўчым відам рэальнасці, якія выступаюць як аб'екты пазнання (субстанцыя, якасць, дзеянне, усеагульнасць, асаблівасць, уласцівасць).

**АБХА́ЗІЯ**, Абхазская Аўтаномная Рэспубліка. Размешчана

ў паўн.-зах. ч. Закаўказзя, на Чарнаморскім узбярэжжы Каўказа. Пл. 8,6 тыс. км². Нас. 533,8 тыс. чал. (1991), гарадскога 48%. Нац. склад у 1989: грузіны (25%), абхазы (18%), армяне (15%), рускія (14%), грэкі, украінцы і інш. Сярэдняя шчыльн. 61 чал. на 1 км², найб. 150—200 чал. на нізінах і ў перадгор'ях (93% усяго насельніцтва). Сталіца — г. *Сухумі*, найб. гарады Ткварчэлі, Гагра, Ачамчыра, Гудаута, Галі.

**Прырода**. Большая ч. тэр. на паўд. схілах Галоўнага, ці Водападзельнага, хрыбта (найвыш. пункт г. Дамбай-Ульген, 4046 м), які акаймоўвае А. з Пн. Найбуйнейшыя адгор'і: Гаграўскі, Бзыбскі, Абхазскі, Кадорскі хрыбты. Пашыраны карставыя з'явы, шмат пячор (найб. і найдаўжэйшая Новаафонская). На ПдУ Калхідская нізіна. Радовішчы каменнага вугалю (Ткварчэлі), поліметал. руд, ртуці (Авадхарскае), барыту (Піцыкварскае, Ашшрынскае); выхады мінер. крыніц (Ткварчэлі, Рыца, Авадхара і інш.). Клімат на нізінах і ў перадгор'ях субтрапічны, вільготны, у гарах умерана цёплы і халодны, снегавое покрыва ляжыць 2—3 месяцы. Сярэдняя т-ра студз. на ўзбярэжжы 4—7°С, у гарах ад 2 да -2 °С, ліп. адпаведна 22—24 °С і 16—18 °С. Сярэднегадавая колькасць ападкаў на нізіне і ў перадгор'ях 1300—1500, у гарах да 2000—2400 мм за год. Бязмарозны перыяд у прыморскай паласе 250—300 дзён. Найб. значныя рэкі — Кадоры, Бзыб, Келасуры, Гуміста — шматводныя, багатыя гідраэнергіяй; пераважае дажджавое і снегавое жыўленне. На выш. 882 м воз. Рыца. Глебы на нізінах балотныя, у перадгор'ях падзолістыя, чырвана- і жаўтазёмныя. Пад лесам больш за 55%. На нізінах і ў цяснінах невял. масівы шыракалістых лясоў (граб, дуб, каштан і інш.), у перадгор'ях букавыя, у верхняй ч. гор піхтавыя лясы, вышэй за 2000 м субтрапічнае крывалессе, альпійскія лугі. На мысе Піцунда захаваўся гай рэліктавай хвоі. На ўзбярэжжы субтрапічная раслінасць (пальмы, магноліі, кіпарысы, эўкаліпты). У лясах трапляюцца высакародны алень, казуля, кабан, рысь, на нізінах — шакал. Запаведнікі: Гумісцінскі, Піцундскі, Псхускі, Рыцынскі.

**Гісторыя**. Найб. стараж. паселішчы чалавека на тэр. А. адносяцца да эпохі палеаліту і неаліту. Продкі *абхазаў* належалі да абарыгенаў Зах. Каўказа. У асірыйскіх надпісах яны ўпамінаюцца як абышлы, у антычных крыніцах — як абазгы (на Пн) і апсілы (на Пд). З сярэдзіны 1-га тыс. да н.э. А. ўваходзіла ў *Калхідскае царства*, у 6—5 ст. да н.э. на яе марскім узбярэжжы ўзніклі грэч. калоніі Дыяскурыяда, Пітыунт і інш. У 1 ст. н. э. тут утварыліся раннефеад. княствы, залежныя ад Рыма. З 4 ст. тэр. А. ў складзе царства *Лазіка*. У 6 ст. пад уплывам Візантыі тут афіцыйна прынята хрысціянства. У перыяд *Абхазскага царства* ў 8—10 ст. завяршылася аб'яднанне стараж. абх. плямёнаў у адзіную народнасць. З 975 А. ў складзе аб'яднанай Грузіі, на мяжы 16—17 ст. самастойнае княства, у 17—18 ст. пад уладай Турцыі, ч. насельніцтва перайшла ў мусульманства (канфесійная неаднароднасць захавалася і цяпер). Супраць тур. панавання абхазы паўставалі ў 1725, 1728, 1733, 1771, 1806. Пасля далучэння ў 1810 да Рас. імперыі ў А. захоўвалася ўнутр. самакіраванне. Пасля Каўказскай вайны 1817—64 княжацкая ўлада ліквідавана, на тэр. А. ўтворацы Сухумскі ваенны аддзел, пазней— ваенная акруга. Частка абх. насельніцтва перасялілася ў Турцыю і на Б. Усход. У 1866 аўтахтоннае насельніцтва на тэр. А. складала больш за 85%, у 1876 — 55,3%, затое доля груз. насельніцтва выраслa больш як у 4 разы — 24,4%. 10.3.1917 у А. створаны К-т грамадскай бяспекі — орган часовага кіравання, у ліст. — Нар. Савет. У чэрв. 1918 А. занялі груз. войскі, матывуючы гэта барацьбой супраць бальшавізму. Пасля ўстанаўлення ў лютым 1921 сав. улады ў сак. А. абвешчана сав. сацыяліст. рэспублікай. 16.12.1921 яна на дагаворнай аснове ўвайшла ў Груз. ССР, а ў снеж. 1922 як састаўная яе частка ў складзе ЗСФСР увайшла ў СССР. 1.4.1925 прынята 1-я Канстытуцыя А. 3 лют. 1931 А. — аўт. рэспубліка ў складзе Груз. ССР. За гады сав. улады доля тытульнага насельніцтва рэспублікі працягвала зніжацца, што вяло да напружання ў груз.-абх. адносінах; мелі месца антыгруз. масавыя хваляванні (1964, 1967, 1978, 1989). Найб. вастрыні гэтыя супярэчнасці дасягнулі ў 1992, калі Вярх. Савет Грузіі прыняў рашэнне аб вяртанні да Канстытуцыі Груз. Дэмакр. Рэспублікі 1921, у якой А. як суб'ект дзярж. прававых адносін не згадваецца. У адказ Вярх. Савет А. пастанавіў вярнуцца да Канстытуцыі рэспублікі 1925, якая абумоўлівала дагаворныя адносіны паміж А. і Грузіяй. Летам 1992 разгарэўся ўзбр. *грузіна-абхазскі канфлікт 1992—94*. У канцы 1993 пачаліся груз.-абх. перагаворы пад эгідай ААН. 4.4.1994 груз. і абх. дэлегацыі падпісалі ў Маскве пагадненні аб мерах па паліт. урэгуляванні. У зону груз.-абх. канфлікту ўведзены міратворчыя сілы Расіі. 26.11.1994 Вярх. Савет абвясціў дзярж. незалежнасць рэспублікі, прыняў новую Канстытуцыю і абраў першага прэзідэнта — У.Ардзынбу.

Да арт. **Абхазія**. Прыморскі парк у Гагры.

Да арт. **Абхазія**. Возера Рыца.

**Гаспадарка**. А. — раён вырошчвання субтрапічных цытрусавых культур, тытуню, чаяводства. Прамысловасць звязана пераважна з перапрацоўкай с.-г. сыравіны (60% ад агульнай вытв-сці прамысл. прадукцыі); чайная, тытунёвая, вінаробная, рыбная, кансервавая прам-сць. Прадпрыемствы машынабуд., металаапр., абутковай, швейнай, дрэваапр. прам-сці. Сухумская ГЭС і Ткварчэльская ДРЭС. Важныя галіны сельскай гаспадаркі — тытуняводства (жоўты тытунь «Самсун»), чаяводства, вырошчванне цытрусавых, тунгу, эфіраалейных. Развіты вінаградарства і пладаводства. Жывёлагадоўля пераважна малочнага і мяса-малочнага кірунку. Вялікае эканам. значэнне мае курортная гаспадарка і турызм. Курорты — Гагра, Піцунда, Новы Афон, Гудаута, Сухумі, Гульрыпш. Сухумі — адзін з буйнейшых партоў Закаўказзя. Па прыморскай паласе праходзіць чыг. Туапсэ—Сухумі—Самтрэдыя і аўтадарога Новарасійск—Сухумі—Батумі.

**Культура**. У 1988 у А. больш за 210 дашкольных устаноў (16,7 тыс. дзяцей), 319 агульнаадук. школ (84,6 тыс. вучняў); 7 сярэдніх спец. навуч. устаноў (2,1 тыс. навучэнцаў), 2 ВНУ (Абхазскі

ун-т і ін-т субтрапічнай гаспадаркі), сухумскі ф-т Груз. тэхнал. ун-та (усяго 7,7 тыс. студэнтаў); 391 б-ка з кніжным фондам 4,3 млн. экз. Абхазскі дзярж. музей, Музей абхазскай зброі, Музей-выстаўка ў Піцундзе. Навук. даследаванні вядуцца ў Ін-це эксперым. паталогіі і тэрапіі, Абхазскім філіяле НДІ курарталогіі і фізіятэрапіі, НДІ турызму, Сухумскім бат. садзе.

Радыё і тэлебачанне вядуць перадачы на абх., груз. і рус. мовах. Рэтранслюцца радыё- і тэлепраграмы з Тбілісі, Сочы, Масквы.

Вытокі абх. літаратуры ў нар. творчасці, у багатым фальклоры, які ўключае шматлікія жанры — ад гераічных эпічных паданняў пра волатаў-нартаў і багаборца Абрскіла (эпас «Абрскіл» запісаны ў 19 ст.) да лірычных песень і мудрых афарызмаў. Першую спробу скласці абх. алфавіт на рус. графічнай аснове зрабіў у 1862 рас. мовазнавец П.К.Услар. Першы буквар выд. ў 1865. Заснавальнік маст. л-ры Дз. *Гулія*. Пад яго рэдакцыяй выходзіла першая абх. газ. «Апсны» («Абхазія», 1919—20). Першую абх. драму («Махаджыры», 1920) напісаў С.Чанба. Вядомасць набыла творчасць паэтаў І.Кагонія, Л.Квіцынія, К.Агумаа, Б.*Шынкубы*, Ш.Цвіжбы, А.Ласурыя і інш. У 1930-я г. пачала фарміравацца проза: раманы І.Папаскіры і Гулія, аповесці Чанбы, У.Агрбы, Цвіжбы, апавяд. М.Хашбы. У пасляваеннай прозе вызначаюцца раманы І.Папаскіры «Шлях Хімур», «Каля падножжа Эрцаху», «Жаночая годнасць», аповесці Агумаа, М.Хашбы, П.Чкадуа, М.Папаскіры, А.Гогуа, вершы, паэмы, апавяданні Квіцынія, Л.Лабахуа, Агумаа, Д.Дарсалія, С.Кучберыя, П.Чкадуа, раманы ў вершах «Мае землякі» і «Песня пра скалу» Шынкубы, творы І.Тарбы, М.Лакербая, А.Ласурыя, А.Джонуа, К.Ломія, К.Чачхалія, Г.Гублія, У.Анквабы. Уклад у абх. л-ру зрабілі Н.Тарба, Гогуа, Ш.Чкадуа, Д.Ахуба і інш. У дзіцячай л-ры плённыя набыткі ў Д.Тапагуа, Г.Папаскіры; у крытыцы — у Ш.Інал-Іпы, Х.Бгажбы, М.Дзелбы, Ш.Салакія і інш. У перакладзе на бел. мову выйшлі кніга Гулія «Выбранае» (1974) і раман Тарбы «Сонца ўзыходзіць у нас» (1979).

З найб. стараж. твораў выяўл. мастацтва на тэр. А. вядома кераміка, жаночыя статуэткі з Ачамчырскага селішча, Эшэрскі і Атхарскі дальмены. Да ант. помнікаў адносіцца Сухумская крэпасць (2—3 ст.), разнастайныя ўзоры прыкладнога мастацтва. З сярэдневяковай архітэктуры вылучаюцца базіліка ў Піцундзе, храмы ў сёлах Бедыя і Лыхны, «замак Баграта» ў Сухумі, Беслецкі мост, а таксама разны іканастас у царкве с. Ольгінскае, залаты абраз св. Кацярыны, каляровыя малюнкі на керамічным посудзе і інш. Нар. мастацтва А.—разьба і інкрустацыя па дрэве, гравіроўка па метале, ткацтва дываноў, вышыўка, пляценне паясоў. У канцы 19— пач. 20 ст. пабудаваны гасцініцы і палац у Гагры, дом Алаізі ў Сухумі, закладзены паркі ландшафтны і прыморскі ў Гагры, дэндралагічны ў Сухумі. Сярод сучасных буйнейшых збудаванняў: ін-т субтрапічнай гаспадаркі ў Сухумі, санаторый «Расія», курортны комплекс у Піцундзе. Жывапісцамі (С.Габелія, Х.Авідзба і інш.) створаны карціны на гіст. тэмы, пейзажы, партрэты, нацюрморты; развіваюцца скульптура (В.Іванба, Ю.Чкадуа і інш), графіка (Т.Ампар, З.Джынджаліа і інш.), тэатр.-дэкар. (Т.Жванія) і дэкар.-прыкладное (В.Шэнгелая, В.Хурхумал і інш.) мастацтва. У 1939 заснавана Абх. аддз. Саюза мастакоў Грузіі, у 1946 — Абх. аддз. Саюза архітэктараў Грузіі.

Муз. фальклор А. захаваў стараж. ўзоры абрадавых, сямейна-быт., гіст.-гераічных песень, танцаў, інстр. найгрышаў. Пераважае 2- і 3-галоссе; сустракаюцца ўзоры антыфоннага спявання, гетэрафоніі і інш. Сярод традыц. інструментаў: струнна-смычковы апхерца; струнна-шчыпковыя — аюмаа (тыпу арфы), ахымаа; духавыя — ачарпын, абык; ударны — адаул; самагучальны — акапкап (трашчотка). Першыя збіральнікі нар. песень К.Ковач, К.Дзідзарыя (1920-я г.). Прафес. музыка фарміруецца з 1930-х г. Творы буйных форм стварылі Дз.Шведаў, А.Чычба, Р.Гумба, М.Берыкашвілі і інш. Працуюць (1988): філармонія, сімф. аркестр, хар. капэла, Дом нар. творчасці, Ансамбль песні і танца Абхазіі, ансамбль доўгажыхароў «Нартаа». Муз. вучылішча (1930). У 1971 засн. Саюз кампазітараў Абхазіі.

Вытокі тэатр. культуры абхазаў у нар. гульнях, абрадах, вуснай нар. творчасці. З 1915 у Сухумі ставіліся аматарскія спектаклі. У 1921 створана абх. вандроўная трупа пад кіраўніцтвам Дз.Гулія. З 1928 працаваў драм. т-р у Сухумі (абх. і груз. трупы). На базе абх. драм. студыі ў 1930 у Сухумі адкрыты Абх. нац. т-р (з 1967 імя С.Чанбы). У яго рэпертуары нац. драматургія, інсцэніроўкі нар. паданняў і легендаў, сучасныя і класічныя п'есы.

*Літ.*: Лакоба С.З. Очерки политической истории Абхазии. Сухуми, 1990; Марыхуба И.Р. Об абхазах и Абхазии: Ист. справка. Сухум (Акуа), 1993; Очерки истории Абхазской АССР. Ч. 1—2. Сухуми, 1960—64. *В.К.Міхеева* (прырода, гаспадарка), *В.С.Клімовіч* (гісторыя).

**АБХА́ЗСКАЕ ЦА́РСТВА**, раннефеад. дзяржава ў Закаўказзі з цэнтрам у Кутаісі. У 780-я г. абх. князь Леон II узначаліў барацьбу Зах. Грузіі супраць Візантыі, дамогся поўнай незалежнасці яе зямель і прыняў тытул цара. У гэты час у А.ц. ўваходзіла таксама ч. Усх. Грузіі. Значна ўмацавалася ў 9 — 1-й пал. 10 ст. Пры царах Георгію (п. у 955) і Леоне III [955—967] паспяхова вяло барацьбу з Тао-Кларджэцкім і Кахецінскім царствамі за панаванне ў Грузіі. Аслабленне А.ц. пры Дэметру [967—975] прывяло да першынства Тао-Кларджэты. У 975 А.ц. ўвайшло ў склад аб'яднанай феад. Грузіі.

**АБХА́ЗСКАЯ МО́ВА**, адна з *іберыйска-каўказскіх моў* (абхаза-адыгская група). Пашырана пераважна ў *Абхазіі* і некаторых краінах Бл. Усходу. Мае 2 дыялекты: абжуйскі (аснова літ. мовы) і бзыбскі, блізкія да *абазінскай мовы*.

Фанетыка багатая сістэмай зычных (58) пры наяўнасці 2 галосных фанем («а», «ы»). Націск інтэнсіўны, нефіксаваны. Граматычны лад аглюцінатыўна-сінтэтычны. У марфалогіі няма сістэмы скланення; структура дзеяслова вызначаецца мноствам грамат. катэгорый. Пісьменства створана ў 1862 на рус., у 1928 на лац. аснове, у 1938 пераведзена на груз., з 1954 — на рус. графіку.

*Літ.*: Ломтатидзе К.В. Абхазский язык // Языки народов СССР. М., 1967. Т. 4.

**АБХА́ЗСКІ ХРЫБЕ́Т**, на паўд. схіле *Вялікага Каўказа*, усх. працяг Бзыбскага хр. ў Абхазіі. Даўж. каля 60 км. Выш. да 3156 м. Грэбень з рэзкімі горналедавіковымі формамі. Складзены з юрскіх парфірытаў і сланцаў. Горныя лясы, высакагорныя лугі. Ледавікі.

**АБХА́ЗЫ** (саманазва а п с у а), нацыя, асн. насельніцтва *Абхазіі* (93,3 тыс. чал.). Усяго ў Рас. Федэрацыі і інш. краінах СНД 105 тыс. чал. (1989), у Турцыі — 5 тыс. чал. Гавораць на *абхазскай мове*. Паводле рэлігіі праваслаўныя і мусульмане-суніты.

**АБХІРА́ЦІ**, у будыйскай міфалогіі рай, які быццам бы знаходзіцца на ўсходзе. Своеасаблівая утопія, для якой характэрна поўнае ўраўноўванне ўсяго: у А. няма ні гор, ні далін, усе дрэвы маюць аднолькавую вышыню, усе людзі аднолькава шчаслівыя, не пакутуюць ад хвароб і інш.

**АБХО́Д**, 1) манеўр войск з мэтай глыбокага пранікнення ў размяшчэнне праціўніка і нанясення яму ўдараў з флангаў і тылу або акружэння яго. Ажыццяўляецца ва ўзаемадзеянні з войскамі, што дзейнічаюць з фронту, пры наяўнасці адкрытых флангаў або прамежкаў у баявых парадках праціўніка. У ВМФ робіцца для нанясення ўдару па гал. аб'екце праціўніка без агнявога сутыкнення з сіламі яго прыкрыцця. 2) Участак лесу (адзін або некалькі кварталаў), які даглядаецца, абслугоўваецца адным лесніком.

**АБХО́Д**, абрадавы звычай абыходзіць кожны двор у час каляндарных святаў з віншавальна-велічальнымі, заклінальнымі песнямі і музыкай, добрымі пажаданнямі. Важны элемент у комплексе асн. каляндарных *абрадаў* усх. славян і інш. народаў (сербаў, румынаў). Найб. яркія А. — валачобныя (мужчынскія групы) і калядныя (змешаныя; гл. *Валачобнікі, Калядаванне*). Удзельніцамі бел. і ўкр. куставага А. (гл. *Куст*) былі выключна дзяўчаты або жанчыны. Магічнае дзеянне А. накіравана на засцярогу ад варожых сіл, спрыянне дабрабыту і паспяховае вырашэнне сямейных клопатаў.

**АБЦІСКА́ННЕ** ў металаапрацоўцы, аперацыя *коўкі* або *штампоўкі*, у выніку якой памяншаецца плошча папярочнага сячэння загатоўкі і павялічваецца яе даўжыня. Дасягаецца *пластычнай дэфармацыяй* матэрыялу пад уздзеяннем радыяльных сціскальных намаганняў. А. прутковых і таўстасценных трубчастых загатовак атрымліваюць рэдукаваныя прутки, фасонныя канічныя вырабы, ступеньчатыя суцэльныя і полыя валы. Танкасценныя полыя загатоўкі абціскаюць у штампах з пустотнай матрыцай, каб надаць краявой частцы загатоўкі канічную, цыліндра-канічную, сферычную і інш. форму.

**АБЦІСКНЫ́ СТАН**, *пракатны стан* для перапрацоўкі абціскannем буйных зліткаў са сталі або каляровых металаў у загатоўку — выходны прадукт для вытв-сці гатовага пракату. Да А.с. адносяцца *блюмінг*, *блюмінг-слябінг* і *слябінг*.

**АБЦЯ́ЖВАЮЧЫЯ АДКА́ЗНАСЦЬ**

**АКАЛІ́ЧНАСЦІ**, у крымінальнай справе акалічнасці, наяўнасць якіх сведчыць пра павышаную грамадскую небяспечнасць пэўнага злачынства і самога злачынцы. Улічваюцца судом пры вызначэнні пакарання і, як правіла, цягнуць за сабой больш суровую кару ў межах санкцыі адпаведнага артыкула КК Рэспублікі Беларусь. Паводле КК, да А.а.а. адносяцца: паўторнасць злачынства; учыненне яго арганізаванай групай; карыслівыя або інш. ганебныя матывы яго ўчынення; прычыненне злачынствам цяжкіх вынікаў; учыненне злачынства супраць малалетніх, састарэлых і бездапаможных; падбухторванне ці ўцягванне ў злачынную дзейнасць непаўналетніх; асаблівая жорсткасць або здзек над пацярпелым; выкарыстанне ўмоў грамадскага бедства; усеагульнанебяспечны спосаб учынення злачынства; выкарыстанне для злачынства крыніцы павышанай небяспечнасці; учыненне злачынства асобай, якая была ўзята на парукі; учыненне злачынства ў нецвярозым стане.

*І.І.Пацяружа.*

**АБЧУ́ГА**, вёска ў Беларусі, у Крупскім р-не Мінскай вобл., на р. Бобр. Цэнтр сельсавета і калгаса «Абчуга». За 30 км на ПнУ ад Крупак, 150 км ад Мінска, 25 км ад чыг. ст. Бобр, 347 ж., 157 двароў (1994).

Упамінаецца ў інвентарах 17 ст. як вёска каля мяст. Красны Стаў у складзе маёнтка Чарэя, які належаў Сапегам. З 1793 у складзе Рас. імперыі, уласнасць памешчыка Нітаслаўскага, злілася з мястэчкам пад агульнай назвай А. У 2-й пал. 19 ст. ў А. 678 ж., 77 двароў. У пач. 20 ст. цэнтр воласці ў Сенненскім пав., 353 ж., 125 двароў, уласнасць памешчыцы Э.А.Ястрамбіцкай. З 1924 цэнтр сельсавета ў Чарэйскім, з 1931 — у Крупскім р-не.

Сярэдняя школа, б-ка, клуб, бальніца, аддз. сувязі.

**АБШЧЫ́НА**, устойлівая форма сацыяльнай арганізацыі, якая характарызуецца пэўнай ступенню калектыўнай уласнасці на сродкі вытворчасці, асаблівасцямі працэсу вытворчасці і сацыяльна-грамадскага жыцця. Узнікла як арг-цыя крэўных родзічаў (радавая, сямейная А.) у першабытнаабшчынную эпоху, калі прымітыўны ўзровень развіцця прадукц. сіл і вытв. адносін не дазваляў людзям паасобку здабываць неабходныя для існавання сродкі. Першабытнай А. ўласцівыя калект. ўласнасць на сродкі вытв-сці, калект. размеркаванне прадуктаў працы, роўнасць усіх членаў. Базісам радавой А. была зямля як уласнасць усяго калектыву. З узнікненнем прыватнай уласнасці радавая А. паступова трансфармавалася ў суседскую (тэрытарыяльную). У ходзе яе развіцця адбывалася вылучэнне ў якасці сямейна-індывід. уласнасці асобных надзелаў зямлі, жывёлы, прылад працы, жылля. Але А. заставалася вярх. уласнікам усёй тэрыторыі вёскі, лясоў, пашаў і інш. зямель агульнага карыстання. Члены суседскай А. некаторыя работы выконвалі сумесна, але кожная сям'я вяла асобную гаспадарку. А. існавала як адносна самастойны адм.-прававы інстытут, якому належалі значныя судовыя, павіннасныя, гасп. і інш. паўнамоцтвы т.зв. *звычаёвага права*. Ва ўсх. славян станаўленне суседскай А. («вервь», «мір») адбывалася ў 1-й пал. 1-га тысячагоддзя. У 9—12 ст. А. была адносна самаст. арг-цыяй сельскага насельніцтва, яе члены лічыліся свабоднымі людзьмі. З паступовым падпарадкаваннем А. княжацкай уладзе з'явілася праслойка людзей, якія абаранялі інтарэсы гэтай улады (*цівун*, *агнішчанін* і інш.). На землях Беларусі ў перыяд яе знаходжання ў *Вялікім княстве Літоўскім* А. (называлася грамада) выконвала значную ролю ў арганізацыі сял. землекарыстання, самакіравання і выплаты феад. рэнты. На чале грамады стаяў *старац*, яму дапамагалі дзесяцкія. Поруч са старцамі ў гаспадарскіх валасцях прызначаліся велікакняжацкія наместнікі. Грамада перашкаджала феадалам павялічваць павіннасці, рэгулявала парадак карыстання абшчыннымі ўгоддзямі і выплаты падаткаў, чыніла *копны суд*. У ходзе агр. рэформы сярэдзіны 16 ст. роля грамады паменшала, асабліва ў зах. і цэнтр. Беларусі, дзе была праведзена *валочная памера*, якая ўводзіла падворнае землекарыстанне. Але яе роля павялічвалася ў часы войнаў, эпідэмій, ва ўмовах гасп. разрухі. У 18 ст. грамада яшчэ карысталася пэўнай самастойнасцю, аднак яна ўсё больш ператваралася ў залежны ад феадала орган. Пасля далучэння Беларусі да Рас. імперыі (1772—95) «Палажэннем аб валасным і сельскім кіраванні» (1797) у дзярж. уладаннях уводзілася сістэма сельскага абшчыннага кіравання, аналагічная расійскай. Правы сял. А. ў дзярж. маёнтках не ахоўваліся законам. У выніку *сялянскай рэформы 1861* А. і яе выбарныя органы сталі ніжэйшым звяном адм. кіравання ў вёсцы на землях сялян усіх катэгорый. Функцыі А., абавязкі і правы валаснога і сельскага сходаў, выбраных імі валаснога старшыны і сельскага старасты, а таксама сял. валаснога суда вызначаны «Агульным палажэннем аб сялянах, якія выйшлі з прыгоннай залежнасці». На Беларусі ўтварэнне пав. устаноў па сял. справах (канец 1870-х г.) і ўвядзенне інстытута земскіх участковых начальнікаў (пач. 20 ст.) павялічвалі адм.-паліцэйскі кантроль над органамі абшчыннага самакіравання. З сярэдзіны 19 ст. пытанне аб сутнасці А. займала прыкметнае месца ў гістарыяграфіі (гл. *Абшчынная тэорыя*), у ідэйным і грамадска-паліт. жыцці. Вялікае значэнне А. надавалі народнікі, якія лічылі яе зародкам сацыялізму, адносін у вёсцы (гл. *Народніцтва*). Развіццё тавара-грашовых адносін, разлажэнне сялянства як класа (сялян, буржуазію і сельскі пралетарыят) вялі да распаду А., што найбольш яскрава праяўлялася ў пазбаўленні збяднелых сялян зямлі. У Рас. імперыі, у т.л. ва Усх. Беларусі, абшчыннае землеўладанне моцна падарвала *сталыпінская аграрная рэформа* пач. 20 ст. У многіх месцах Беларусі абшчыннае землекарыстанне існавала да канца 1920-х г. А. як суседскае аб'яднанне сялян-аднаасобнікаў ліквідавана ў выніку суцэльнай *калектывізацыі* сельскай гаспадаркі.

Віды паверхні краявой часткі загатовак пасля **абцiскання**: *а* — канічная; *б* — цыліндра-канічная; *в* — сферычная.

А. мела месца ў гісторыі многіх народаў (*задруга* ў паўд. славян, *марка* ў Германіі і інш.). Яна існавала да пранікнення ў земляробства капіталіст. адносін.

*Літ.*: Энгельс Ф. Паходжанне сям'і, прыватнай уласнасці і дзяржавы // Маркс К., Энгельс Ф. Выбр. тв. Мн., 1952. Т. 2 (Соч. 2 изд. Т. 21); Ковалевский М. Общинное землевладение, причины, ход и последствия его разложения. Ч. 1. М., 1879; Ленін У.І. Развіццё капіталізму ў Расіі // Тв. Т. 3 (Полн. собр. соч. Т. 3); Голубеў В.Ф. Сялянскае землеўладанне і землекарыстанне на Беларусі XVI—XVIII стст. Мн., 1992; Панютич В.П. Социально-экономическое развитие белорусской деревни в 1861—1900 гг. Мн., 1990.

*В.Ф.Голубеў, В.П.Панюціч.*

**АБШЧЫ́ННАЯ ТЭО́РЫЯ**, маркавая тэорыя, сістэма поглядаў у гістарыяграфіі 2-й пал. 19 ст., паводле якой выходным пунктам агр. эвалюцыі і ўсяго сац. ладу сярэднявечча была *абшчына* (марка). Асн. прынцыпы А.т. вы-

клаў і абгрунтаваў Г.Л.*Маўрэр* (Германія). Мела пашырэнне ў гіст. навуцы, у рус. медыявістыцы 1870—90-х г. была пануючая. Асн. сцверджаннем А.т. было тое, што грамадскаму ладу, заснаванаму на прыватнай уласнасці, папярэднічаў лад, заснаваны на калект. апрацоўцы зямлі і на калект. уласнасці на зямлю.

*Літ.*: Данилов А.И. Проблемы аграрной истории раннего средневековья в немецкой историографии конца XIX—нач. XX в. М., 1958; Павлов-Сильванский Н.П. Феодализм в России. М., 1988.

Абэ Коба.

Л.С.Абэцэдарскі

**АБШЫВА́НКА**, лодка, выдзеўбаная са ствала, з нашытымі для большай устойлівасці дашчанымі бартамі. На Беларусі ў некаторых мясцовасцях А. называлі лодку, цалкам збітую (сшытую) з дошак. А. была пашырана да 20 ст. пераважна на Падняпроўі. У наш час А. называюць звычайную дашчаную лодку.

**АБЫВА́ЦЕЛІ**, 1) назва паўнапраўных грамадзян у прававых актах 16 ст. ў ВКЛ і Польшчы. У 17—18 ст. А. называлі шляхціцаў Рэчы Паспалітай, у 19— пач. 20 ст. — памешчыкаў на тэр. Беларусі, Украіны, Літвы і Польшчы. 2) У Рас. імперыі афіц. назва саслоўя гараджан, а таксама назва сталых жыхароў якой-н. мясцовасці. 3) Людзі, якія жывуць дробнымі, вузкаасабістымі інтарэсамі.

**АБЫЛКАСЫ́МАВА** Майрамкан (н. 8.1.1936, калгас «Камсамол» Кемінскага р-на, Кыргызстан), кіргізская паэтэса. Нар. паэтэса Кыргызстана (1980). Скончыла Кіргізскі жаночы пед. ін-т (1958). Аўтар зб-каў вершаў і паэм «Венера» (1962), «Гэтай вясною шмат кветак» (1965), «Веру ў сэрцы берагу» (1968), «Ты ведаеш мяне, Айчына» (1973), «Невычэрпная песня» (1977), «Рэха юнацтва» (1979) і інш.

**АБЫХО́Д**, у ВКЛ у 16—17 ст. мяжа вакол зямельнага ўчастка (ворнай зямлі, лесу, маёнтка і інш.). А. называўся таксама акт, у якім вызначалася гэта мяжа.

**АБЫ́ЧАЙ ЗВЫ́КЛЫ**, гл. ў арт. *Звычай*.

**А́БЭ КО́БА** (сапр. Кіміфуса; н. 7.3.1924, Токіо), японскі пісьменнік. Вядомасць А.К. прынеслі раманы-прытчы «Жанчына ў пяску» (1962), «Чужы твар» (1964), «Спаленая карта» (1967), «Чалавек-скрынка» (1973), «Тайнае спатканне» (1977), «Каўчэг «Сакура» (1984) і інш., гратэскава-фантаст. п'есы «Паляванне на рабоў» (1955), «Прывіды сярод нас» (1958), «Сказанне пра веліканаў» (1960), «Крэпасць» (1962), «Мужчына, які ператварыўся ў дубінку» (1969) і інш. У цэнтры твораў А.К. маральна-філас. праблемы, трагедыя адзіноцтва ў сучасным свеце, працэс адчужэння асобы, матывы безвыходнасці. Аўтар аповесці «Сцяна. Злачынства S. Карума» (1951; літ. прэмія Акутагавы).

*Тв.*: Бел. пер.— Жанчына ў пяску; Чужы твар. Мн., 1986; рус. пер.— Избранное. М., 1988.

**АБЭВІ́ЛЬ** (франц. Abbeville), абэвільская культура, археалагічная культура ранняга (ніжняга) палеаліту ў Еўропе. Назва ад г. Абвіль (Францыя, даліна р. Сома), дзе ў 19 ст. знойдзены найб. тыповыя для яе прылады — ручныя масіўныя (даўж. да 10—20 см) груба адбітыя рубілы міндалепадобнай, авальнай ці коп'епадобнай формы; выкарыстоўваліся і адшчэпы. Верагодна, датуецца часам гюнц-міндэльскага міжледавікоўя і міндэльскага зледзянення (каля 700 — 400 тыс. г. таму назад). Большасць сучасных даследчыкаў разглядаюць А. як пачатковы этап эпохі *ашэль*. У л-ры трапляецца і ўстарэлая назва А. — шэльская культура, ці шэль.

**АБЭ́РАК** (польск. oberek ад obrót абарот, вярчэнне), польскі нар. парны танец. Муз. памер троздольны, тэмп хуткі. Асн. харэатэхнічны элемент — вярчэнне. Выконваецца ў суправаджэнні інстр. музыкі і жартоўных прыпевак. Зафіксаваны ў 2-й пал. 19 ст. О.Кольбергам і М.Федароўскім як «шляхетны» танец, пашыраны ў вясковым побыце зах. Беларусі. Найгрышы да А. захоўваюцца ў рэпертуары нар. музыкантаў амаль на ўсёй тэр. рэспублікі.

**АБЭЦЭДА́РСКІ** (Абецадарскі) Лаўрэнцій Сямёнавіч (12.7.1916, г. Горкі Магілёўскай вобл. — 6.7.1975), бел. гісторык. Д-р гіст. н., праф. (1966). Чл.-кар. АПН СССР (1968). Скончыў БДУ (1946), працаваў там выкладчыкам, заг. кафедры гісторыі СССР (1950—58), гісторыі БССР (з 1958). Вывучаў рус.-бел. адносіны ў 2-й пал. 16—17 ст., нац.-вызв. і антыфеад. барацьбу нар. мас Беларусі ў 17 ст. Пачатковы перыяд гісторыі Беларусі разглядаў як агульны этап гісторыі старажытнай Русі, асобныя факты і падзеі ацэньваў з вульгарна-сацыялагічных пазіцый. Сабраў вялікі матэрыял пра перасяленне беларусаў у Маскву і Замаскварэцкі край у 2-й пал. 17 ст., якое не заўсёды абгрунтавана лічыў добраахвотным. Звярнуў увагу на значны бел. элемент у развіцці культуры Масквы ў 2-й пал. 17 ст. Прыхільнік унітарнай канцэпцыі аб'яднання ўсходнеславянскіх народаў вакол Масквы і Маскоўскай дзяржавы. Адзін з аўтараў «Гісторыі Беларускай ССР» (т. 1—2, 1954—61; т. 1—5, 1972—75).

*Тв.*: Белорусы в Москве XVII в.: Из истории рус.-бел. связей. Мн., 1957; Белоруссия и Россия: Очерки рус.-бел. связей второй половины XVI—XVII в. Мн., 1978.

**«АБ'ЯДНА́НАЕ АНТЫСАВЕ́ЦКАЕ ПАДПО́ЛЛЕ»** («ААП»), назва неіснаваўшых «антысавецкіх дыверсійна-шкодніцкіх, шпіёнскіх, тэрарыстычных і паўстанцкіх арганізацый», выкарыстаная ў 1937—38 у перыяд масавых паліт. рэпрэсій супрацоўнікамі НКУС БССР для фабрыкацыі шэрагу паліт. працэсаў на Беларусі. Гал. матыў абвінавачвання — «барацьба супраць Камуністычнай партыі і савецкага ўрада». Паводле абвінаваўчых актаў, «ААП» складалася з 6 самаст. арг-цый: «правых», «бундаўска-сіянісцкай», «нацыянал-фашысцкай», «трацкісцка-тэрарыстычнай», «шпіёнска-паўстанцкай», «эсэраўскай». У кіраўнікі «ААП» былі залічаны М.М.Галадзед, М.Ф.Гікала, В.Ф.Шаранговіч, А.Р. Чарвякоў, З.Х.Жылуновіч (Ц.Гартны), А.А.Чарнушэвіч, П.Бадунова і інш. У 1937—38 арыштавана і засуджана больш за 2570 чал., абвінавачаных у прыналежнасці да «ААП», «Кіраўнікі» і «актыўныя члены» гэтых арг-цый былі прыгавораны да расстрэлу, астатнія — да розных тэрмінаў папраўча-працоўных лагераў. Іх рэабілітацыя адбывалася на працягу 1955—89.

*Т.С.Процька.*

**АБ'ЯДНА́НАЕ ДЗЯРЖА́ЎНАЕ ПАЛІТЫ́ЧНАЕ ЎПРАЎЛЕ́ННЕ** пры СНК СССР (АДПУ), орган па ахове дзярж. бяспекі ў СССР у 1923—34. Створана 2.11.1923 у выніку рэарганізацыі *Дзяржаўнага палітычнага ўпраўлення* РСФСР і ДПУ саюзных рэспублік у сувязі з утварэннем СССР. Паводле Палажэння аб АДПУ ад 15.11.1923 яно ствараласа «з мэтай аб'яднання рэв. намаганняў рэспублікі па барацьбе з паліт. і эканам. контррэвалюцыяй, шпіянажам і бандытызмам». Узначальвалі АДПУ Ф.Э.*Дзяржынскі*, з 1926 В.Р.*Мянжынскі*. АДПУ кіравала ДПУ саюзных рэспублік і асобымі аддзеламі, а таксама трансп. органамі, аховай граніц СССР, аператыўнай работай у агульнасаюзным маштабе, мела ў распараджэнні асобыя войскі. У 1923 паводле пастановы ЦВК СССР пры АДПУ створана Калегія, або асобая нарада, якая без суда разглядала справы і выносіла рашэнні аб накіраванні ў канцлагеры або расстрэле асоб, прызнаных вінаватымі. Загадам старшыні АДПУ ад 2.2.1930 пры паўнамоцных прадстаўніцтвах АДПУ у рэспубліках і абласцях былі сфарміраваны «тройкі» з такімі ж паўнамоцтвамі. АДПУ скасавана ў выніку рэарганізацыі дзярж. апарату СССР. Замест яго ў сістэме НКУС створана Гал. ўпраўленне дзяржбяспекі.

*І.М.Кузняцоў.*

**АБ'ЯДНА́НАЯ АРА́БСКАЯ РЭСПУ́БЛІКА** (ААР), афіцыйная назва з лют. 1958 да вер. 1961 аб'яднанай дзяржавы ў складзе Егіпта і Сірыі, з

28.9.1961 да 11.9.1971 — афіц. назва Арабскай Рэспублікі Егіпет (гл. *Егіпет*).

**АБ'ЯДНА́НАЯ БЕЛАРУ́СКАЯ ВАЙСКО́ВАЯ ШКО́ЛА** імя ЦВК БССР, ваенна-навуч. ўстанова, якая рыхтавала кадры сярэдняга каманднага саставу для бел. нац., тэрытарыяльных і кадравых фарміраванняў Чырв. Арміі ў 1924—37. Тэрмін навучання 3 гады. Засн. на базе 81-х мінскіх пяхотных курсаў (з 1921). Камплектавалася курсантамі пераважна з карэннага насельніцтва. Большасць дысцыплін выкладалася на бел. мове. Выдавала шматтыражную газ. «Чырвоны сцяг». Рэарганізавана ў *Мінскае ваеннае вучыліша*. Сярод выхаванцаў Маршал Сав. Саюза І.І.Якубоўскі, генералы арміі В.А.Пянькоўскі, В.П.Маргелаў.

*В.М.Герасімаў.*

**АБ'ЯДНА́НАЯ ДЭМАКРАТЫ́ЧНАЯ ПА́РТЫЯ БЕЛАРУ́СІ** (АДПБ), партыя ліберальна-дэмакр. кірунку. Утворана ў 1990. Кіруючыя органы — рада і выканаўчы к-т. Мэта дзейнасці АДПБ — стварэнне грамадзянскай супольнасці і прававой дзяржавы, заснаваных на прыярытэце агульначалавечых каштоўнасцяў, плюралізме ва ўсіх галінах грамадскага развіцця. Выступае з пазіцый развіцця прыватнай уласнасці і рынкавых адносін у эканоміцы, станаўленні незалежнай дзяржавы Беларусь, падтрымлівае сувязі і супрацоўнічае з усімі грамадска-паліт. арг-цыямі, партыямі і рухамі некамуніст. арыентацыі незалежных дзяржаў СНД і краін Еўропы.

**АБ'ЯДНА́НАЯ ЭЛЕКТРАЭНЕРГЕТЫ́ЧНАЯ СІСТЭ́МА**, сукупнасць электраэнергет. сістэм пэўнага рэгіёна, аб'яднаных *лініямі электрапередачы* (напружанне пераважна 220—750 кВ) для паралельнай работы з аператыўным кіраваннем з адзінага дыспетчарскага цэнтра. Аб'яднанне энергасістэм дазваляе кампенсаваць нераўнамернасць энергет. нагрузкі ў іх з-за несупадзення ў часе сутачных яе максімумаў, змяншае залежнасць энергаспажывання ад гідралагічных і кліматычных умоў, зніжае неабходную рэзервовую магутнасць. *Беларуская энергетычная сістэма* аб'ядноўвае Цэнтр., Паўд. і Паўн.-Зах. мясц. энергасістэмы.

**АБ'ЯДНА́НАЯ ЯЎРЭ́ЙСКАЯ САЦЫЯЛІСТЫ́ЧНАЯ РАБО́ЧАЯ ПА́РТЫЯ** (АЯСРП), яўрэйская нац. партыя сацыяліст. арыентацыі ў Расіі ў 1917—20. Утворана на аб'яднаным з'ездзе *Сацыялістычнай яўрэйскай рабочай партыі* і *Сіянісцка-сацыялістычнай партыі* (ліп. 1917). Зыходная ідэя партыі — стварэнне самастойнага яўр. грамадства ў дыяспары на аснове нац.-паліт. аўтаноміі. Прадугледжвала скліканне экстэрытарыяльных парламентаў (соймаў), якія павінны вырашаць усе пытанні яўр. жыцця ў дыяспары. Канчатковая праграмная мэта — стварэнне ў Палесціне «нацыянальнага ачага» як «асобнага яўрэйскага сацыялістычнага грамадства». Абапіралася на дэмакр. інтэлігенцыю, рамеснікаў і некат. рабочых. Аб'ядноўвала каля 5 тыс. чал. (1917). Кіраўнікі Ш.Ківін, Н.Уфрыхціч, М.Гутман і інш. На Беларусі вяла барацьбу з *Бундам* за паліт. ўплыў, але паступова эвалюцыяніравала ў яго бок. У 1917—18 супрацоўнічала з *Беларускай радай*, *Беларускай сацыялістычнай грамадой*. Удзельнічала ў стварэнні *Народнага сакратарыята Беларусі*. Падтрымала абвяшчэнне БНР. Ва ўмовах змагання супраць польскіх інтэрвентаў зблізілася з бальшавікамі, і яе члены ўвайшлі ў склад СНК Літ.-Бел. ССР (май 1919). ЦК партыі падтрымаў рэзалюцыю XII канфер. Бунда (Масква, крас. 1920) аб тым, што патрабаванне нац.-культ. аўтаноміі траціць сэнс пры сац. рэвалюцыі. Зліўся з Бундам. *М.С.Сташкевіч.*

**АБ'ЯДНА́ННЕ** (ваен.), вайсковае фарміраванне, у якое ўваходзяць нескалькі злучэнняў або меншых па складзе А., а таксама часцей і ўстаноў. Паводле складу і задач, якія вырашаюцца, бывае: стратэгічнае (узбр. сілы, кааліцыйныя аб'яднаныя ўзбр. сілы на тэатрах ваен. дзеянняў), аператыўна-стратэгічнае (фронт, група армій, флот), аператыўнае (армія, флатылія, эскадра, авіяцыя флоту і інш.), аператыўна-тактычнае (злучэнні і часці розных радоў войскаў, спецвойскаў і службаў аднаго віду ўзбр. сіл), тэрытарыяльнае агульнавайсковае (гл. *Ваенная акруга*).

Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

ЧЫРВОНЫ СЦЯГ Орган Бюро КП(б)Б ЦК КП(б)Б і Беларускай Вайсковай Школы імя ЦВК БССР

№ 33. 6 лістапада 1930 году.

НАША ШКОЛА заняла першае месца ў РСЧА па стралковай справе.

У XIV ГОДЗЕ ПРАЛЕТАРСКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ будзем змагацца за пяршынства ў РСЧА ва ўсіх галінах БАЯВОЙ ПАДРЫХТОЎКІ.

Задачы на наступны вучэбны год.

Газета «Чырвоны сцяг» Аб'яднанай беларускай вайсковай школы (6 ліст. 1930).

**АБ'ЯДНА́ННЕ БЕЛАРУ́СКІХ СТУДЭ́НЦКІХ АРГАНІЗА́ЦЫЙ** Заходняй Беларусі і эміграцыі ў Празе (АБСА). Дзейнічала ў жн. 1924 — вер. 1939. Заснавана на канферэнцыі бел. студэнцкіх арг-цый. Установчы з'езд адбыўся 29.6.1926. Мэта — «аб'яднанне ўсяго бел. студэнцтва на грунце акадэмічнай самапомачы», прапаганда ідэі незалежнасці і непадзельнасці Беларусі. У 1924 прынята ў склад Аб'яднання студэнцкіх эміграцкіх арг-цый Усх. Еўропы, 27.8.1926 — у Міжнар. студэнцкую канфедэрацыю (CIE). Выпускала бюлетэнь на франц. мове (з 1924) пра дзейнасць арг-цый бел. студэнтаў, становішча на Беларусі, супрацоўнічала ў перыяд. выданнях CIE. У 1930-я г. наладзіла сувязь з арг-цыямі бел. студэнтаў у Амерыцы, Германіі, Латвіі, Літве, шэрагу гарадоў Еўропы, у АБСА увайшлі Т-ва беларусазнаўства пры Віленскім ун-це імя С.Баторыя (у Вільні працаваў аддзел прэзідыума АБСА на чале з С.Станкевічам), гурток бел. студэнтаў у Бруселі, Саюз бел. студэнтаў у Германіі. Старшыні: В.Жук-Грышкевіч, з 1926 М.Гузоўскі, з 1932 А.Вітушка. Спыніла дзейнасць у сувязі з пачаткам 2-й сусв. вайны. *Ю.Р.Васілеўскі.*

**АБ'ЯДНА́ННЕ СУЧА́СНЫХ АРХІТЭ́КТАРАЎ**, Усерасійскае аб'яднанне сучасных архітэктараў. Існавала ў 1925—31 у Маскве. Засн. арх. групай літ.-маст. аб'яднання Левы фронт мастацтваў. Выступала пад лозунгам *канструктывізму* і *функцыяналізму*, прапагандавала выкарыстанне найноўшых канструкцый і матэрыялаў, тыпізацыю і індустрыялізацыю буд-ва. Выдавала час. «Современная архитектура» (1926—30).

**АБ'ЯДНА́ННЕ СЯЛЯ́НСКАЙ ЛЯВІ́ЦЫ «САМАПО́МАЦ»**, рэвалюцыйна-дэмакратычная сялянская арг-цыя ў Польшчы, Зах. Беларусі і Зах. Украіне ў 1928—31. Створана з членаў левага крыла партыі «Стронніцтво хлопске» і Незалежнай сял. партыі. Праграма змяшчала рэв.-дэмакр. і часткова сацыяліст. патрабаванні: зямля сялянам без выкупу, нацыяналізацыя прам-сці, дэмакр. правы, самавызначэнне прыгнечаным народам і інш. У маі 1931 аб'ядноўвала 12,5 тыс. членаў. Кіраўнікі А.Бомба, С.Вуйтовіч, М.Гвяздовіч і інш. Друкаваны орган — газ. «Samopomoc chłopska» («Сялянская ўзаемадапамога»). Супрацоўнічала з левымі партыямі і арг-цыямі Польшчы. Забаронена польскімі ўладамі. *У.А.Палуян.*

**АБ'ЯДНА́ННЕ Ў АБАРО́НУ РЭСПУ́БЛІКІ**, Аб'яднанне ў падтрымку рэспублікі (Rassemblement pour la République; РПР), палітычная партыя ў Францыі. Засн. ў 1958 прыхільнікамі Ш. дэ *Голя* пад назвай Саюз за новую рэспубліку, неаднаразова мяняла назвы, сучасная — з 1976. Асн. праграмныя палажэнні прадугледжваюць незалежны курс на міжнар. арэне, узмацненне ролі дзяржавы і прыярытэт прэзідэнцкай улады. Абапіраецца на дзярж. апарат. З 1976 лідэр Ж.*Шырак*. У 1993 каля 900 тыс. чал.

**АБ'ЯДНА́НЫЯ АРА́БСКІЯ ЭМІРА́ТЫ** (ААЭ), Імарат аль-Арабія

аль-Мутахіда, дзяржава на Блізкім Усходзе. Займае паўд.-ўсх. ч. Аравійскага п-ва, абмываецца водамі Персідскага і Аманскага заліваў. Федэрацыя з 7 эміратаў: Абу-Дабі, Дубай (Дыбай), Аджман, Ум-эль-Кайвайн, Рас-эль-Хайма, Эль-Фуджайра, Шарджа. Пл. 83,6 тыс. км$^2$. Нас. 1,86 млн. чал. (1992). Афіц. мова арабская. Дзярж. рэлігія — іслам суніцкага кірунку. Сталіца — г. *Абу-Дабі*. Нац. свята — Дзень утварэння федэрацыі (2 снеж.).

**Дзяржаўны лад**. ААЭ — федэратыўная дзяржава. Кожны эмірат, які ўваходзіць у яе, — абсалютная манархія і мае значную самастойнасць. Паводле Часовай Канстытуцыі 1971 вышэйшы орган дзярж. улады — Вышэйшы Савет з правіцеляў эміратаў, які са свайго складу выбірае прэзідэнта тэрмінам на 5 гадоў. Урад узначальвае прэм'ер-міністр, якога прызначае прэзідэнт. Функцыі дарадчага органа выконвае Федэральны нац. сход (40 чал.), куды ўваходзяць прадстаўнікі ўплывовых плямёнаў, дзелавых колаў і інтэлігенцыі.

Герб і сцяг Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў.

**Прырода**. Большая ч. тэр. — пустынная раўніна, на Пд і ПдЗ пераходзіць у пустыню *Руб-эль-Халі*, на У — адгор'і Аманскіх гор (выш. да 1127 м). Узбярэжжа Персідскага заліва нізіннае, шмат дробных астравоў. Асн. карысныя выкапні — нафта (запасы 13,3 млрд. т) і прыродны газ (5,8 трлн. м$^3$), пераважна ў эміратах Абу-Дабі і Дубай. Знойдзены таксама каменны вугаль, жал. руда, храміты, руды нікелю, медзі і інш. Клімат трапічны, сухі. Т-ра паветра ў студз. каля 20 °С, у ліп. 30—35 °С (макс. да 50 °С), ападкаў на раўнінах 100—150 мм за год, у гарах 300—400 мм (макс. зімой). Пастаянных рэк няма, шмат сухіх рэчышчаў (вадзі). Раслінны і жывёльны свет бедны. На раўніне рэдкія аазісы з вінаграднікамі, фінікавымі пальмамі, акацыямі, тамарыскамі. У гарах расліннасць тыпу саваннаў. Сярод жывёл — газелі, зайцы, яшчаркі. У прыбярэжных водах тунец, макрэль, стаўрыда, сардзіны, селядцы; водмелі багатыя жэмчугам.

**Насельніцтва**. За апошнія 30 гадоў насельніцтва павялічылася прыкладна ў 30 разоў, пераважна за кошт іміграцыі. Больш за палавіну насельніцтва складаюць арабы — мясц. ўраджэнцы, выхадцы з Егіпта, Сірыі, Емена і інш. араб. краін. Жывуць індыйцы і пакістанцы (разам 600 тыс. чал.), іранцы (200 тыс. чал.), еўрапейцы (25 тыс. чал.). Асн. ч. насельніцтва ў эміратах Абу-Дабі і Дубай. Гар. насельніцтва 84% (1986). Буйнейшыя гарады (1985): Абу-Дабі, Дубай (330 тыс. ж.), Эль-Айн (150 тыс. ж.), Шарджа (120 тыс. ж.).

**Гісторыя**. У канцы 4 — пач. 3-га тыс. да н.э. тэр. ААЭ была заселена семіцкімі плямёнамі, якія стварылі тут найб. стараж. ў Аравіі матэрыяльную культуру. У 3-м — пач. 1-га тыс. да н.э. гэтая тэр. ў складзе дзяржавы Дыльмун. Тут жылі семіцкія плямёны халдзеяў, узніклі першыя паселішчы фінікійцаў. У канцы 1-га тыс. да н. э. з паўд. і паўд.-ўсх. Аравіі на ўзбярэжжа Персідскага заліва прасунуліся араб. плямёны. На тэр. сучасных ААЭ (наз. Ас-Сір) імі засн. адна з першых араб. дзяржаў Харакен. Пазней яна распалася на дробныя княствы, якія ў 4—6 ст. трапілі ў залежнасць ад дзяржавы *Сасанідаў*, у 7—11 ст. уваходзілі ў склад Арабскага халіфата (гл. *Халіфат*); пануючай рэлігіяй стаў іслам. У 11—15 ст. княствы і султанаты Ас-Сіра ўваходзілі ў бахрэйнскую дзяржаву карматаў, Багдадскі халіфат, Аман, Армуз, Маскат, Асманскую імперыю. У 16 ст. пачалася каланізацыя Ас-Сіра партугальцамі, потым англічанамі і галандцамі. У выніку барацьбы пазіцыі англічан узмацніліся, у 1819 яны атрымалі перамогу над мясц. араб. насельніцтвам, якое называлі піратамі, а тэр. княстваў адпаведна Пірацкім берагам. У 1853 паміж Вялікабрытаніяй і правіцелямі дробных эміратаў падпісаны «Дагавор аб вечным міры», паводле якога Пірацкі бераг атрымаў назву Аман Дагаворны (АД). У канцы 19 ст. Вялікабрытанія ўстанавіла над ім свой пратэктарат, які дзейнічаў да канца 2-й сусв. вайны. У выніку нац.-вызв. руху, а таксама націску амер. нафтавых кампаній брыт. панаванне аслабла. У канцы 1960-х г. брыт. ўрад прыняў рашэнне аб вывадзе сваіх узбр. сіл з раёна Персідскага заліва (завершаны ў 1971). 2.12.1971 6 эміратаў АД (Абу-Дабі, Дубай, Шарджа, Аджман, Эль-Фуджайра, Ум-эль-Кайвайн) абвясцілі пра стварэнне федэратыўнай дзяржавы — ААЭ; у лют. 1972 да іх далучыўся эмірат Рас-эль-Хайма. Дзейнасць палiт. партый і арг-цый забаронена. ААЭ — чл. ААН, ОПЕК, Лігі арабскіх краін, арг-цыі «Ісламская канферэнцыя» і інш. Дыпламат. зносіны з Рэспублікай Беларусь устаноўлены 20.10.1992.

Аб'яднаныя Арабскія Эміраты. У цэнтральнай частцы г. Дубай.

**Гаспадарка**. Аснова эканомікі — нафтагазавая прам-сць. У 1993 здабыта 108 млн. т нафты, 26 млрд. м$^3$ газу, у т.л. ў Абу-Дабі адпаведна 89 млн. т і 20 млрд. м$^3$. Нафтаперапр. з-ды ва Ум-ан-Нары і Рувейсе, газаперапрацоўчыя ў Рувейсе, Джэбель-Алі, на в-ве Дас, у Шарджы (выпрацавана 17 млрд.·кВт гадз эл. энергіі; 1991); алюмініевы з-д у Джэбель-Алі (156 тыс. т алюмінію ў год); працуе 9 цэментных з-даў (3,1 млн. т у 1990), з-д па вытв-сці азотных угнаенняў (228 тыс. т; 1990/91), буйнейшы ў свеце сухі док для рамонту супертанкераў у Дубаі. Развіты (пераважна ў Дубаі і Шарджы) саматужныя промыслы: выраб дываноў, шарсцяных тканін, залатых і сярэбраных упрыгожанняў.

Для вырошчвання с.-г. культур прыдатныя толькі 0,5% тэрыторыі. Пашы і лугі займаюць 2,4%. Крыху лепшыя ўмовы для сельскай гаспадаркі ў горных раёнах эміратаў Эль-Фуджайра і Рас-эль-Хайма. Пашыраецца аазіснае земляробства са штучным арашэннем (вырошчваюць агародніну, фінікі, віноград, манга, збожжавыя і інш.). Буйной раг. жывёлы 53 тыс. галоў (1991), авечак 270 тыс. галоў. Гадоўля вярблюдаў, птушкагадоўля, рыбалоўства (95 тыс. т; 1991), здабыча жэмчугу. Забяспечваюць сябе малаком, яйкамі і інш. прадуктамі харчавання. Асн. транспарт — аўтамабільны. Знешнегандл. сувязі забяспечвае пераважна марскі транспарт. Порты Джэбель-Алі і Рашыд у эміраце Дубай, Зейд у Абу-Дабі і Эль-Фуджайра. Міжнар. аэрапорты ў Абу-Дабі, Дубаі, Шарджы, Рас-эль-Хайме, Эль-

Айне, Эль-Фуджайры. Рэгулярныя і чартэрныя рэйсы звязваюць ААЭ з многімі краінамі свету, у т.л. з Беларуссю. Свабодная эканам. зона ў аэрапорце Джэбель-Алі (эмірат Дубай). Горад Дубай — цэнтр рээкспарту і турызму. ААЭ — буйны фінансавы цэнтр Б.Усходу. Агульныя дэпазіты 63 дзеючых у краіне камерц. банкаў на пач. 1992 склалі 43 млрд. дол. ЗША. Праз ААЭ (асабліва эмірат Дубай) штогод праходзіць да 170 т золата, з якіх прыкладна 40 т застаецца ў эміратах. ААЭ вывозіць нафту і нафтапрадукты (18,4 млрд. дол. ЗША; 1991), звадкаваны газ, алюміній, цэмент, рыбу, фінікі, жэмчуг. Увозяць машыны і абсталяванне, трансп. сродкі, быт. тэхніку, гатовыя вырабы, харч. прадукты. Гандаль вядзецца ў асн. з Японіяй, ЗША, зах.-еўрап. і араб. краінамі. Дзякуючы паскоранаму развіццю нафтагазавай прам-сці і прыбыткам ад яе ў эміратах дасягнуты высокія тэмпы эканам. росту, забяспечаны адзін з самых высокіх сярэдніх гадавых даходаў у свеце ў разліку на душу насельніцтва, створаны сучасныя гарады і інфраструктура. ААЭ аказваюць значную фінансавую дапамогу краінам, якія развіваюцца. Грашовая адзінка — федэральны дырхам.

*Літ.*: Абдалла Я.Ю. Объединенные Арабские Эмираты. М., 1978; Географический справочник: новые цифры, факты, названия. М., 1993; Исаев В.А., Озолинг В.В. Катар; Объединенные Арабские Эмираты. М., 1984; Клековский Р.В., Лукцкевич В.А. Объединенные Арабские Эмираты. М., 1979; Information please: Almanac, 1995. Boston; New Jork, 1995.

*М.С.Вайтовіч* (прырода, гаспадарка), *Кошалеў У.С.* (гісторыя).

**«АБ'ЯДНА́НЫЯ ІРЛА́НДЦЫ»** (United Irishmen), ірландская паліт. арг-цыя ў 1791—98. Створана ў г. Белфаст Т.У.*Тонам*, Э.*Фіцджэралдам*, Т.Раселам і інш. з мэтай дасягнення свабоды каталіцкага веравызнання, правядзення (разам з пратэстантамі) парламенцкай рэформы. З 1794 ператварылася ў падп. рух за незалежнасць Ірландыі. Вяла перамовы з рэв. Францыяй аб ваен. дапамозе. Напярэдадні запланаванага на 1798 паўстання лідэры «А.і» былі арыштаваны, што пазбавіла паўстанцаў цэнтралізаванага кіраўніцтва. Толькі ў графстве Уэксфард яны захапілі частку тэр., але не ўтрымалі яе. Паўстанне пацярпела крах.

**АБ'ЯДНА́НЫЯ НА́ЦЫІ**, тэрмін, прыняты для назвы дзяржаў, якія ў час 2-й сусв. вайны 1939—45 уваходзілі ў *антыгітлераўскую кааліцыю* і стварылі ў 1945 *Арганізацыю Аб'яднаных Нацый* (ААН). У літаратуры і афіц. публікацыях выкарыстоўваецца і як скарочаная назва ААН.

**АБ'ЯДНА́НЫЯ САЦЫЯ́Л-ДЭМАКРАТЫ́ЧНЫЯ АРГАНІЗА́ЦЫІ** («аб'яднанкі»), агульныя арганізацыі бальшавікоў і меншавікоў, якія існавалі ў 1917 на тэр. Расіі. На Беларусі ў іх уваходзілі таксама бундаўцы. Да сак. 1917 такія арг-цыі сфарміраваліся ва ўсіх бел. гарадах і многіх злучэннях Зах. фронту. Адзінства ў «аб'яднанках» не было з моманту іх стварэння, хоць не было і выразнага фракцыйнага падзелу. Пасля VII (Красавіцкай) канферэнцыі РСДРП (1917) акрэслілася тэндэнцыя на размежаванне бальшавіцкіх арг-цый з інш. партыямі і групамі ў прамысл. цэнтрах Расіі. Пасля VI з'езда РСДРП(б), які вызначыў курс на ўзбр. паўстанне, бальшавікі фарсіравалі разрыў з меншавікамі. У ліп. 1917 пачалі афармляцца раздзельныя арг-цыі ў Бабруйску, Рэчыцы, многіх вайск. часцях Зах. фронту і тылавых гарнізонах. Да жн. — вер. 1917 працэс размежавання ў «аб'яднанках» на Беларусі цалкам завяршыўся. Утварыліся Паўн.-Зах. абласныя арг-цыі РКП(б) і РСДРП (меншавікоў), абласны к-т Бунда.

*Літ.*: Игнатенко И.М. Февральская буржуазно-демократическая революция в Белоруссии. Мн., 1986; Большевики Белоруссии в борьбе за победу Октября. Мн., 1987.

*А.С.Кароль.*

**АБ'ЯДНА́ЎЧЫ З'ЕЗД КАМПА́РТЫЙ БЕЛАРУ́СІ, ЛІТВЫ́ І ЗАХО́ДНЯЙ БЕЛАРУ́СІ**, гл. *Другі з'езд КП(б)Б.*

**АБЯЗБО́ЛЬВАННЕ**, штучнае адключэнне ўспрымання болю пры хірург. аперацыях, інш. лячэбных і дыягнастычных працэдурах, траўмах і некаторых захворваннях. Пастаяннае А. практыкуецца пры нясцерпных працяглых болях, пакутах (напр., у анкалагічнай практыцы). Часовае А. з'яўляецца звычайнай працэдурай у лячэбнай, асабліва хірург., практыцы; ажыццяўляецца без парушэння свядомасці (мясцовае А., або мясцовая анестэзія), а таксама з яе парушэннем (агульнае А., або *наркоз*). Сродкі і метады А. розныя, прадугледжваюць выкарыстанне хім. (наркотыкі і інш. анестэзіруючыя прэпараты), фіз. (электраток, холад) і нейрапсіхічных (штучная блакада або хірург. адключэнне пэўных участкаў нерв. сістэмы, гіпнатычнае ўздзеянне) фактараў. Ад правільнасці іх выбару залежыць зыход цяжкіх хірург. аперацый (памылкі ў выбары могуць прывесці да пасляаперацыйнага шоку). Вывучэннем праблем А. займаецца *анестэзіялогія*.

*І.І.Канус.*

**АВАГА́ДРА** (Avogadro) Амедэо (9.8.1776, г. Турын — 9.7.1856), італьянскі фізік і хімік. Атрымаў юрыд. адукацыю, самастойна вывучаў хімію, фізіку і матэматыку. Чл.-кар. (1804), ардынарны акад. (1819) АН у Турыне. У 1820—22 і 1834—50 праф. фізікі Турынскага ун-та. Прапанаваў гіпотэзу (1811), паводле якой малекулы газаў складаюцца з аднаго або некалькіх атамаў (гэтая думка выказана на 70 гадоў раней М.В.Ламаносавым). Сфармуляваў адзін з асн. законаў ідэальных газаў (гл. *Авагадра закон*), прапанаваў метад вызначэння атамных і малекулярных масаў. Імем А. наз. *Авагадра пастаянная*.

*Літ.*: Быков Г.В. Амедео Авогадро. М., 1970.

**АВАГА́ДРА ЗАКО́Н**, адзін з асноўных законаў малекулярнай фізікі, паводле якога ў роўных аб'ёмах ідэальных газаў пры аднолькавых т-ры і ціску змяшчаецца аднолькавая колькасць малекул. Адкрыты А.*Авагадра* ў 1811. З А. з. вынікае, што пры аднолькавых т-ры і ціску 1 моль кожнага ідэальнага газу займае аднолькавы аб'ём, роўны пры нармальных умовах $22{,}4 \cdot 10^{-3}$ м$^3$, ці 22,4 л, а шчыльнасці газаў прама прапарцыянальныя іх малекулярным масам.



А.Авагадра.

**АВАГА́ДРА ПАСТАЯ́ННАЯ**, адна з асноўных фіз. пастаянных; колькасць часціц (атамаў, малекул і інш.) у адзінцы колькасці рэчыва. Пазначаецца $N_a$. Назва ў гонар А. *Авагадра*. А.п. істотная для вызначэння інш. фіз. пастаянных. $N_a = 6{,}022169\ (40) \cdot 10^{23}$ моль $^{-1}$.

**АВАДА́НА** (санскр., літар. апавяданне), апавяданні пра рэліг. і маральна-этычныя подзвігі будыйскіх прапаведнікаў; жанр л-ры будызму ў Індыі. Паводле традыц. уяўленняў, А. расказваліся Будай. Найб. цікавыя з іх «Збор ста авадан» («Аваданашатака») і «Божая авадана» («Дзіўявадана»).

**«АВАДЗЕ́НЬ»**, часопіс гумару і сатыры. Выдаваўся ў Вільні ў 1924—25 на бел. мове раз у 2 тыдні. У 1929 зроблена спроба аднавіць выданне (выйшлі 2 нумары: апошні, 13-ы, у лют. 1933). Рэдактар-выдавец А.Васілеўскі. У «А.» пераважаў бытавы гумар. З ростам нац.-вызв. руху закранаў і надзённыя пытанні грамадскага жыцця Зах. Беларусі, адлюстроўваў барацьбу працоўных супраць праяў сац. і нац. прыгнёту. Друкаваў гумарэскі, фельетоны, гумарыстычных і сатыр. замалёўкі Васілеўскага, Г.Леўчыка, У.Паўлюкоўскага, І.Маразовіча (Я.Маланка), В.Гаротнага і інш. З «А.» выйшлі заснавальнікі сатыр. час. «*Маланка*».

**АВАДНІ́**, насякомыя з атр. двухкрылых. Пашыраны на ўсіх мацерыках, акрамя Антарктыды. Належаць да 3 сям.: насаглотачных (Oestridae), падскурных (Hypodermatidae) і страўнікавых (Jastrophilidae) А. Каля 160 відаў, з іх на Беларусі 11. Найб. трапляюцца А. авечы (Oestrus ovis), А. бычыны (Hypoderma bovis) і А. кручок (Jastrophilus

intestinalis). Часта А. блытаюць са *слянямі*.

Цела даўж. 9—22 мм, укрыта валаскамі, радзей голае. Ротавыя органы рудыментарныя. Не жывяцца, жывуць 3—25 сутак за кошт рэчываў, назапашаных у лічынкавай стадыі. У развіцці праходзяць стадыі яйца, лічынкі (9—10 месяцаў), кукалкі, дарослай асобіны. Самкі насаглотачных А. жывародныя, падскурных і страўнікавых адкладваюць яйцы. Спелыя лічынкі акукліваюцца ў глебе, гнаі, паразітуюць у скуры, лобных пазухах, насаглотцы, страўніку, галаве, вачах жывёл і чалавека. Вельмі шкодзяць жывёлагадоўлі.

**АВАДО́Н**, у іудаісцкай міфалогіі ўвасабленне ямы-магілы і прадоння апраметнай, якая паглынае, хавае і бясследна знішчае; вобраз, блізкі да анёла смерці. У хрысц. міфалогіі А. вядзе супраць чалавецтва ў канцы свету караючую рацьжахлівай «саранчы».

**АВА́З** Атар-аглы (15.8.1884, г. Хіва — 1919), узбекскі паэт-асветнік. Вучыўся ў медрэсэ. У 18-гадовым узросце стаў прызнаным нар. паэтам Харэзма. Прадаўжальнік традыцый класічнай узб. літаратуры. У вершах рэалістычна адлюстроўваў тагачасную рэчаіснасць, выкрываў феад. знаць і ўлады. Аўтар зб. лірыкі «Шчаслівыя дні». Пісаў розныя па форме вершы (рубаі, газель, кыта і інш.), выкарыстоўваў фальклорныя вобразы.

**АВАКУ́М** Пятровіч (1620 або 1621—14.4.1682), пратапоп, адзін з заснавальнікаў рус. старавераства (гл. *Раскол*), пісьменнік. У 1646—47 чл. «Гуртка рупліўцаў набожнасці». У 1652 пратапоп у г. Юр'евец Павольскі, потым святар Казанскага сабора ў Маскве. Выступаў супраць рэформаў патрыярха *Нікана*, за што неаднаразова быў сасланы ў Табольск, Даурыю, Мезень. У 1667 асуджаны на царк. саборы і сасланы ў Пустазерскі астрог. Аўтар «Жыція пратапопа Авакума» (1672—75), «Кнігі гутарак» (1669—75), «Кнігі тлумачэнняў» (1673—76), «Кнігі выкрыванняў» (1679), «Слоў плачэўных» (1676) і інш. Паводле царскага ўказа спалены.

**АВА́Л** (франц. ovale ад лац. ovum яйцо), замкнёная выпуклая плоская крывая, (напр., *акружнасць*, *эліпс*). Уласцівасці: кожны дастаткова гладкі А. мае не менш як 4 пункты максімуму і мінімуму крывізны; калі адлегласць паміж любымі 2 паралельнымі, датычнымі да А., пастаянная для ўсіх напрамкаў (А. пастаяннай шырыні h), то даўжыня А. роўная πh. А. пастаяннай шырыні атрымліваюць, калі з вяршыні роўнастароннята трохвугольніка са стараной a апісваюць 6 акружнасцей (3 адвольным радыусам r, 3 радыусам, роўным R = a + r). У алг. геаметрыі А. наз. ўсякія замкнёныя (не абавязкова выпуклыя) галіны алг. крывых, што не маюць пунктаў самаперасячэння.

**АВА́ЛІ**, нафтагазавае радовішча ў Бахрэйне, адно з буйнейшых у свеце. Уваходзіць у *Персідскага заліва нафтагазаносны басейн*. Адкрыта ў 1932, распрацоўваецца з 1933. Пачатковыя прамысл. запасы нафты 136 млн. т, газу 530 млрд. м$^3$. Прадукцыйныя паклады на глыб. 0,6—3,5 км. Шчыльн. нафты 850 кг/м$^3$. Больш за 200 фантануючых і помпавакампрэсарных свідравін. Газ сухі, метанавы, выкарыстоўваецца як прамысл. паліва.

**АВАЛІЯ́НІ** Ладо (Уладзімір; н. 15.5.1913, г. Зестафоні, Грузія), грузінскі пісьменнік. Скончыў Тбіліскую АМ (1940). Аўтар апавяданняў, навел, нарысаў (зб-кі навел «Лахіл Першая», 1940; «Паэт-вандроўнік», 1968; «Дубовы чарвяк», 1973, і інш.), рамана пра жыццё рабочых Грузіі «Новы далягляд» (т. 1—3, 1952—68).

**АВА́ЛЬ** (франц. aval), вэксальнае паручыцельства, зробленае трэцяй асобай

Вокладка часопіса «Авадзень». 1925.

Авадні: *1* — авечы; *2* — бычыны; *3* — кручок.



Авал.

(авалістам) у выглядзе спец. гарантыйнага запісу на вонкавым баку *вэксаля* ці прымацаваным да яго дадатковым лісце (алонжы) або ў выглядзе асобнага дакумента. Можа выдавацца на ўсю суму вэксаля ці яе частку. Учыніўшы А., аваліст бярэ на сябе абавязацельства за любую з адказных па вэксалі асоб — вэксалядаўца, акцэптанта, індасанта.

**АВАН**... (ад франц. avant уперадзе, папярадзе), частка складаных слоў, якая адпавядае па значэнні словам «перадавы», «пярэдні», напр., *авантытул*, *авангард*.

**АВАНАВІ́ЛАНА**, у міфалогіі індзейцаў Паўн. Амерыкі бог — стваральнік і першапрычына ўсяго існага. З часцінкі свайго цела ён стварыў светы-блізняты: маці-зямлю і бацьку-неба, ад якіх узнікла ўсё наступнае жыццё.

**АВАНГА́РД** (ад *аван*... + франц. garde варта), 1) часць або падраздзяленне; на флоце яго частка або эскадра падводных караблёў, якія для аховы войск на маршы рухаюцца наперадзе гал. сіл. Задача — прыняць на сябе першы ўдар, не дапусціць раптоўнага нападу праціўніка на гал. сілы, стварыць ім зручныя ўмовы для ўступлення ў бой. А. пасылаецца таксама пры наступленні, праследаванні, у ходзе рэйду. Прымяняўся са стараж. часоў: у арміі Аляксандра Македонскага наперадзе ішлі атрады, якія выконвалі ролю А. Вядомы амаль ва ўсіх сучасных арміях свету. На флоце пасля 1-й сусв. вайны не выкарыстоўваецца. 2) У пераносным сэнсе — найбольш свядомая, перадавая частка якога-небудзь грамадскага руху, паліт. партыі ці групы людзей.

**АВАНГА́РД** у м у з ы ц ы, умоўная назва розных музычна-творчых плыняў 20 ст. Тэрмін «А.» зацвердзіўся з 2-й пал. 1940-х г. у адносінах да шматлікіх школ зах. музыкі, адметных гранічным радыкалізмам, пошукам новых выразных сродкаў, тэхнік кампазіцыі, форм арганізацыі гукавога матэрыялу, абсалютызацыяй эксперыменту, якім спадарожнічае свядомае адмаўленне эстэт. нормаў і традыцый, што выпрацаваны ў мастацтве мінулага.

Своеасаблівымі цэнтрамі А. сталі Францыя, Германія, Італія, ЗША. Сярод прадстаўнікоў А. кампазітары рознай арыентацыі: П.Булез, П.Шэфер, Я.Ксенакіс, К.Штокгаўзен, Л.Нона, Л.Берыо, Дж.Кейдж, Дз.Лігеці. Сярод прыёмаў і метадаў кампазіцыі муз. А. — *серыяльнасць*, пуантылізм, *алеаторыка*, *санорыка*, *электронная музыка*, *канкрэтная музыка*, а таксама шэраг новых прыёмаў гуказдабывання на традыц. інструментах. Гранічнае наватарства ў А. часам становіцца самамэтай, фармальныя навацыі могуць весці да разбурэння эстэт. асноў мастацтва. Аднак некат. эксперыменты буйных кампазітараў выявілі новыя стыліст. сродкі для ўвасаблення ідэй і вобразаў у музыцы 20 ст. і прыняты мастакамі інш. творчых арыентацый. У 1960-я г. — сярэдзіне 1970-х г. узнікла музыка амер. мінімалістаў Т.Райлі, Ла Монт Янга, інстр. т-р М.Кагеля, калажная тэхніка кампазіцыі і інш. з'явы, абагульненыя паняццем поставангард.

У бел. музыцы мастацка-эстэт.

сістэма заходняга муз. А. ў чыстым выглядзе не знайшла ўвасаблення, аднак прыёмы серыйнай тэхнікі, алеаторыкі, санорыкі і інш. выкарыстоўваюць бел. кампазітары С.Картэс, Дз.Смольскі, С.Бельцюкоў, В.Войцік, В.Кузняцоў, В.Капыцько, А.Літвіноўскі, А.Сонін, Л.Шлег, Я.Паплаўскі і інш.

*А.У.Валадковіч.*

**«АВАНГА́РД»**, кірунак у кінамастацтве 1920-х г., абумоўлены пошукамі новых сродкаў выразнасці. Найб. характэрны для франц. і ням. кіно.

У 1-й пал. 1920-х г. «А.» абазначаўся тэрмінам «фотагенія» (паэтычны погляд на рэальнасць, выкарыстанне муз. рытмікі, алегорый, метафарычнай кінамовы, асацыятыўнага мантажу). Выявіўся ў фільмах «Я абвінавачваю» і «Кола» А.Ганса, «Эльдарада» М.Л'Эрб'е, «Вернае сэрца» Ж.Эпштэйна, «Ліхаманка» Л.Дэлюка і інш. У 2-й пал. 1920-х г. у «А.» назіраецца схільнасць да эксперым. фарматворчасці на аснове выявы геам. фігур, ліній, святлаценяў, рытмічных і мантажных кампазіцый — фільмы «Механічны балет» Ф.Лежэ, «Сімфонія вялікага горада» В.Рутмана, серыя «Этюды» О.Фішынгера і інш.; вобразы ствараліся на аснове сюррэалістычных і дадаісцкіх матываў («Антракт» Р.Клера, «Андалузскі сабака» Л.Буньюэля, «Эмак Бакія» М.Рэя, «Ракавіна і свяшчэннік» Ж.Дзюлака і інш.).

*Г.В.Ратнікаў.*

**«АВАНГА́РД»** (Vanguard), серыя амерыканскіх штучных спадарожнікаў Зямлі (ШСЗ) для вывучэння калоземнай прасторы і іх ракет-носьбітаў. Першы амер. ШСЗ належаў да тыпу «А.» (снеж. 1957). З 11 запушчаных «А.» на арбіту выйшлі 3 (1959).

Маса ШСЗ 1,5 — 23 кг. 1-я і 2-я ступені ракеты-носьбіта «А.» вадкасныя, 3-я — цвердапаліўная; макс. карысны груз каля 11 кг пры выведзе на арбіту выш. да 500 км; стартавая маса 10,2 т, даўжыня 22,4 м, дыяметр корпуса 1,14 м.

**АВАНГАРДЫ́ЗМ**, умоўная абагульненая назва мастацкіх кірункаў 20 ст., для якіх характэрны пошукі новых, небывалых, часта штучных формаў і сродкаў мастацкага выяўлення, недаацэнка або адмаўленне традыцый і абсалютызацыя наватарства. Народжаны духоўнай атмасферай часу і яго катаклізмаў, А. адлюстроўвае супярэчнасці паміж рознымі сістэмамі і тэхнікамі кампазіцыі і барацьбу светапоглядных пазіцый. Адны тэарэтыкі і практыкі А. дэкларуюць стварэнне элітарнага мастацтва, адчужанага ад сац. задач, другія, наадварот, звязваюць пошук прынцыпова новых выразных сродкаў з неабходнасцю перадачы настрояў сац. пратэсту. З'яўляючыся крайняй праявай больш шырокага кірунку — *мадэрнізму*, А. выявіўся пераважна не ў закончаных формах, а ў тэндэнцыях да выцяснення традыц. тэм, сюжэтаў і прынцыпаў кампазіцыі, гіпертрафіі ўмоўнасці. Для яго характэрны падкрэсленая эмацыянальнасць, скіраваная непасрэдна да пачуццяў (*экспрэсіянізм*), імкненне разбурыць традыц. эстэтыку (*дадаізм*), замяніць пасіўную эстэтычнасць актыўным сац. дзеяннем («левае» мастацтва і рус. *футурызм*), спроба ўздзейнічаць на падсвядомасць (*сюррэалізм*) і г.д. Пачаў бурна развівацца ў 1910—20-я г., аб'ядноўваючы розных па творчай стылістыцы прыхільнікаў (Л.Арагон, Б.Брэхт, У.Маякоўскі, В.Незвал і інш.), якія бачылі ў А. разбурэнне ідэалаг. міфаў бурж. грамадства. Паступова прынцыповая антыідэалаг. накіраванасць многіх прадстаўнікоў А. прывяла іх у 1960-я г. да поўнага адмаўлення традыц. культуры.

*Літ.*: Гл. пры арт. *Мадэрнізм.* *У.М.Конан.*

**АВАНЕ́САЎ** Рубен Іванавіч (14.2.1902, г. Шуша, Нагорны Карабах — 1.5.1982), рускі моваznавец. Чл.-кар. АН СССР (1958). Д-р філал. н. (1948), праф. (1937). Скончыў Маскоўскі ун-т (1925). Працы па фанетыцы і фаналогіі (адзін з заснавальнікаў Маскоўскай фаналагічнай школы), арфаэпіі і арфаграфіі, гісторыі і дыялекталогіі рус. мовы. Кіраўнік і гал. рэдактар «Агульнаславянскага лінгвістычнага атласа» (1958—82). Адзін з аўтараў і рэдактараў «Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы» (1963) і «Лінгвістычнай геаграфіі і групоўкі беларускіх гаворак» (1968—69; Дзярж. прэмія СССР 1971). Пад яго кіраўніцтвам падрыхтавана першае паслявае. пакаленне бел. лінгвістаў.

*Літ.*: Библиография трудов Р.И.Аванесова // Русское и славянское языкознание: К 70-летию Р.И.Аванесова. М., 1972; Бірыла М.В. Р.І.Аванесаў // Бел. лінгвістыка. Мн., 1983. Вып. 22.

**АВАНЗА́ЛА** (ад *аван...* + франц. salle зала), памяшканне перад гал. залай у вял. грамадскіх будынках, палацах. У сучасных тэатр., кінаканцэртных і інш. відовішчных будынках А. — вестыбюль перад партэрам глядзельнай залы.

**АВАНПО́СТ** (ад *аван...* + франц. poste пост), перадавая варта для назірання за праціўнікам. У арміі Рас. імперыі ў 18—19 ст. А. — перадавая ахоўная варта (пяхотная або конная), якая выстаўлялася дзеля засцярогі свайго войска, размешчанага на адпачынак або ў абароне, ад раптоўнага нападу праціўніка. Выкарыстоўваецца ў сучасных арміях некаторых дзяржаў.

**АВА́НС** (франц. avance), грашовая сума або маёмасная каштоўнасць, якая выдаецца папярэдне ў лік будучых плацяжоў за прадукцыю, работу ці паслугі. А. атрымліваюць работнікі як частку *заработнай платы*, на камандзіровачныя ці госп. затраты. А. могуць атрымліваць прадпрыемствы, установы, прадпрымальнікі пры заключэнні дагавораў і камерцыйных здзелак (у гэтым выпадку А. можа пераводзіцца і па *безнаяўным разліку*). У выпадку невыканання дагавора, паводле якога выдадзены А., ён павінен быць вернуты.

**АВАНСАВА́НЫ КАПІТА́Л**, грашовая сума, затрачаная на куплю сродкаў вытв-сці і рабочай сілы з мэтай атрымання прыбытку. Частка А.к., затрачаная на куплю прылад і прадметаў працы, утварае *пастаянны капітал*, а авансаваная на куплю рабочай сілы — *пераменны капітал*. Прайшоўшы сферу *абарачэння*, А.к. вяртаецца да прадпрымальніка ў выглядзе 3 частак: вартасці спажытых *асноўнага капіталу* і *абаротнага капіталу* (выдаткі вытв-сці) і прыбытку.

**АВАНСЦЭ́НА** (ад *аван...* + *сцэна*), пярэдняя частка сцэны (паміж заслонай і рампай). Як ігравая пляцоўка выкары-

Р.І.Аванесаў.

стоўваецца ў оперных і балетных спектаклях, у драматычных — як месца дзеяння перад закрытай заслонай для невял. сцэн, якія звязваюць асн. карціны спектакля.

**АВАНТУРЫ́ЗМ** (ад франц. aventure прыгода), дзейнасць, заснаваная на рызыкоўных падазроных учынках з мэтай дасягнуць лёгкага поспеху, выгады; справа, распачатая без уліку рэальных умоў і магчымасцяў. Як правіла, мае на мэце задавальненне карыслівых інтарэсаў, але ў большасці выпадкаў канчаецца правалам. Найб. страты грамадству прыносяць палітычны, эканам., ваенны А.

**АВАНТУРЫ́Н**, мінерал, шчыльны празрысты дробназярністы кварц з уключэннямі гематыту, слюды і інш. Колер серабрыста-белы, чырванаватабуры, залаціста-жоўты, радзей зялёны, сіні. Бляск мігатлівы, іскрысты, з пералівамі. Радовішчы звязаны з метамарфічнымі тоўшчамі кварцытаў. Выкарыстоўваецца як вырабны камень (вазы і інш.). Штучны А. — карычневае шкло з уключэннямі ліскікаў метал. медзі, што надае яму залаціста бляск.

**АВАНТЫ́ТУЛ** (ад *аван...* + *тытул*), першая старонка кнігі, якая папярэднічае *тытульнаму лісту*. На А. могуць змяшчацца загаловак кнігі, назва выд-ва, яго марка, серыя і інш. звесткі.

**АВАРА́ЙРСКАЯ БІ́ТВА 451**, адбылася паміж паўстаўшымі армянамі на чале з палкаводцам Варданам Маміканянам і арміяй Сасанідскага Ірана (спрабаваў навязаць сваю рэлігію) 26 мая на Аварайрскім полі (Цэнтр. Арменія). Абодва бакі панеслі вял. страты, у бітве загінуў Маміканян. Перамога іранцаў, армія якіх была ўтрая большая, не была канчатковая — барацьба працягвалася, пакуль Іран не прызнаў права армян на хрысціянскае веравызнанне.

**АВАРО́Т** (вярчэнне) у геаметрыі, від руху, пры якім хоць адзін пункт прасторы застаецца нерухомы. Пры А. на плоскасці ёсць толькі адзін нерухомы пункт — цэнтр А.; пры А. ў прасторы ёсць адна нерухомая прамая — вось А. Кожны рух у прасторы, які адрозніваецца ад зруху і люстранога адбіцця, можна атрымаць шляхам А. вакол некаторай (імгненнай) восі і наступнага зруху ўздоўж гэтай восі (вінтавы рух).

**АВА́РСКАЕ ХА́НСТВА**, феад. дзяржава ў цэнтр. ч. Дагестана ў канцы 12—19 ст. са сталіцай Хунзах. Утварылася на месцы сярэдневяковага «царства» Серыр. Пры Ума-хане (п. 1634) буйное самаст. ўладанне. Найб. магутнасці дасягнула ў 18 ст. З 16 ст. неаднаразова было пад пратэктаратам Расіі, у 1803 увайшло ў яе склад. У 1820—50-я г. ўваходзіла ў *імамат*. У 1864 А.х. ліквідавана рас. урадам і пераўтворана ў Аварскую акругу.

**АВА́РСКАЯ МО́ВА**, адна з *іберыйска-каўказскіх моў* (авара-андацэзская падгрупа). Пашырана на З *Дагестана*. Мае 2 групы дыялектаў: паўночную — зах. (салатаўскі), усх. і хунзахскі (цэнтр.) дыялекты; паўднёвую — андалальскі, гідскі, анцухскі, карахскі, батлухскі, закатальскі дыялекты. Аснова літ. мовы — т.зв. болмац («нар. мова»), сродак вусных зносін паміж носьбітамі розных дыялектаў.

Асаблівасць грамат. ладу — складаная сістэма скланення (да 20 склонаў), адсутнасць катэгорыі асобы ў дзеясловах, эргатыўныя канструкцыі. Пісьменства на аснове араб., з 1928 лац., з 1938 рус. графікі.

*Літ.*: Чикобава А., Церцвадзе И. Аварский язык. Тбилиси, 1962.

**АВА́РСКІ КАГАНА́Т**, гл. ў арт. *Авары*.

**АВА́РЦЫ** (саманазва маарулал), народ у *Дагестане*. 496 тыс. чал.; у іншых рэгіёнах Рас. Федэрацыі і краінах СНД 601 тыс. чал. (1989). Гавораць на *аварскай мове*. Паводле веравызнання мусульмане-суніты.

**АВА́РЫ**, саюз качавых мангола- і цюркамоўных плямёнаў. Паходжанне дакладна не вядома. У сярэдзіне 6 ст. А. ўварваліся з Азіі ў стэпы Зах. Прыкаспія, Паўн. Прычарнамор'е, на землі па Дунаі і на Балканы. Пасля разгрому гепідаў і міграцыі *лангабардаў* у Італію занялі тэр. *Панноніі*, дзе да 568 утварылі сваё дзярж. аб'яднанне — Аварскі каганат. На чале яго стаяў каган, якому падначальваліся ў ваен. адносінах плямёны. А. чынілі набегі на Візантыю (581), франкаў (571 і 596), Ламбардыю (610) і інш. Найб. магутнасці каганат дасягнуў у час праўлення хана Баяна (п. 630). У 2-й пал. 8 ст. ў А. шукалі дапамогі і саюзу саксонцы і баварцы супраць *Карла Вялікага*. У войнах з франкамі (791—803) Аварскі каганат быў знішчаны, пасля 822 звесткі пра А. знікаюць з гісторыі. У рус. летапісах А. называлі обрамі.

**АВАРЫ́ЙНАГА ВЫРАТАВА́ННЯ СІСТЭ́МА** ў касманаўтыцы, бартавая сістэма для выратавання экіпажа касм. карабля ў выпадку аварыі ракеты-носьбіта. Пры аварыі на старце і на пачатковым участку палёту забяспечвае катапультаванне касманаўтаў з касм. карабля з наступным спускам іх на парашутах або аварыйнае аддзяленне спускальнага апарата і адвод яго ад ракеты-носьбіта на бяспечную адлегласць (з дапамогай спец. ракетнага цвердапаліўнага рухавіка) з далейшым прызямленнем апарата з экіпажам на парашуце. Пры аварыі ракеты-носьбіта на вял. вышынях выратаванне экіпажа ажыццяўляецца аддзяленнем спускальнага апарата (ці ўсяго касм. карабля) ад ракеты-носьбіта з наступным палётам яго па траекторыі спуску і тармажэннем у атмасферы і пасадкай. Для памяншэння перагрузак выкарыстоўваецца кіроўны спуск з аэрадынамічнай якасцю.

**АВАРЫ́ЙНЫ ВЫ́КІД** у экалогіі, ненаўмысны выкід забруджвальных рэчываў у прыроднае асяроддзе пры аварыях на прамысл. прадпрыемствах, ачышчальных збудаваннях і інш. тэхн. сістэмах. Па характары блізкі да *залпавага выкіду*. Можа ствараць небяспечныя рэгіянальныя экалагічныя сітуацыі (катастрофа на Чарнобыльскай АЭС, аварыі трубаправодаў, буйных нафтаналіўных танкераў), часцей выклікае *лакальнае забруджванне*. Вынікам А.в. з Чарнобыльскай АЭС было сцэльнае і плямістае забруджванне земляў Беларусі, Украіны і далёкіх тэрыторый.

**АВА́РЫЯ** (італьян. avaria), 1) нечаканы выхад са строю тэхн. сістэмы, машыны, судна, самалёта і інш., іх пашкоджанне. Найб. частыя прычыны А. — адступленні ад нормаў тэхнікі бяспекі або парушэнні правілаў эксплуатацыі абсталявання, будынкаў, машын, тэхн. сістэм, памылкі ў іх праектаванні і тэхн. рэалізацыі. Буйныя А. на прадпрыемствах хім. і ядзернай прам-сці, транспарце (марскім, трубаправодным) могуць суправаджацца экалагічна небяспечнымі *аварыйнымі выкідамі* і чалавечымі ахвярамі. 2) Перан. — непрадбачанае парушэнне ў ходзе якой-н. справы; няўдача, няшчасце.

**АВАСКО́П** (ад лац. ovum яйцо + ...*скоп*), прылада для вызначэння якасці яец прасвечваннем, а таксама для кантролю за развіццём зародка ў час інкубацыі.

**АВАТА́РА** [санскр. літар. сыходжанне, сашэсце (Бога)], у індуізме ўвасабленне бога Вішну ў вобразах інш. багоў, людзей або жывёл. Звязана з верай у перасяленне душы, пашырана з 4—6 ст. н.э. У міфах найб. вядомы 10 А. Вішну (у т.л. ў выглядзе гераяў Крышны, Рамы, вепра, карліка), якія здзяйсняюць подзвігі на зямлі. У будызме А. — наогул увасабленне бажаства.

**АВА́ЦЫЯ** (ад лац. ovatio радасць, весялосць), бурныя, працяглыя апладысменты, якія суправаджаюцца радаснымі воклічамі з выпадку адабрэння каго-н. або прывітання каго-н.

**АВА́ЧЫНСКАЯ СО́ПКА**, Авача, дзеючы вулкан на ПдУ Камчаткі, каля г. Петрапаўлаўск-Камчацкі. Выш. 2741 м (новы кратэр узвышаецца ў старым). Складзены з андэзітавых і базальтавых лаваў, туфаў, шлакаў і попелу. З 1730-х г. было 15 вывяржэнняў, апошняе ў 1945. На схілах лес з каменнай бярозы, кедравы сланік. Вулканалагічная станцыя.

**А́ВАШ**, нацыянальны парк у цэнтр. частцы Эфіопіі. Засн. ў 1969 у цясніне р. Аваш. Пл. каля 9 тыс. га. Стэпавая і лугастэпавая раслінасць з перавагай злакаў, зараснікі калючага хмызняку; у фауне — антылопы (орыкс-бейза, газель Сёмерынга, вадзяны казёл і малы куду), зебра Грэві, леапард.

**АВЕ́ЙДЭ** Аскар (1837, г. Марыямпале, Літва — 20.8.1897), адзін з кіраўнікоў паўстання 1863—64 і яго гісторык. Скончыў Пецярбургскі ун-т са ступенню канд. права (1858). З восені 1862 чл. *Цэнтральнага нацыянальнага камітэта* ў Варшаве па падрыхтоўцы паўстання 1863—64. Прымыкаў да правага крыла «*чырвоных*», змагаўся з «сепаратызмам» К.*Каліноўскага*. Як камісар варшаўскага ўрада ў Літве і Беларусі ў ліп. 1863 прыехаў у Вільню, дзе 22.8.1863 арыштаваны. Выдаў многіх удзельнікаў паўстання. Аўтар запісак пра паўстанне (1866), у якіх ёсць звесткі пра Каліноўскага і яго акружэнне. У 1866 высланы на пасяленне ў Вяцкую губ., дзе і памёр. *Г.В.Кісялёў.*

**АВЕ́КАЎ** Іван Аўдзеевіч (19.5.1919, ст. Асінаўка Аршанскага р-на Віцебскай вобл. — 17.4.1943), Герой Сав. Саюза (1943). Скончыў Харкаўскую ваен. авіяц. школу лётчыкаў-назіральнікаў (1939), Адэскую ваен. авіяц. школу пілотаў (1940). У Вял. Айч. вайну з чэрв. 1941 на Паўд.-Зах., Зах., Цэнтр. франтах. Камандзір эскадрыллі знішчальнага авіяпалка, капітан. Зрабіў 178 баявых вылетаў, збіў асабіста 15 самалётаў праціўніка, разам з вядзёным — 6, адзін самалёт тараніў, 23 знішчыў на аэрадромах. Загінуў у паветр. баі.

**А́ВЕЛЬ**, паводле біблейскай міфалогіі сын *Адама* і *Евы*, пастух авечак, забіты з зайздрасці старэйшым братам *Каінам* за тое, што бог Яхве аддаў перавагу дарам А. У пераносным значэнні — бязвінная ахвяра жорсткасці, правобраз усіх праведнікаў, якія церпяць ганенні.

**АВЕЛЬЯНЕ́ДА** (Avellaneda), горад у Аргенціне, у складзе Вял. Буэнас-Айрэса. Засн. ў 1852. 334 тыс. ж. (1980). Порт у зал. Ла-Плата, чыг. вузел. Мета-

лургічная, мясахаладабойная, гарбарная, абутковая, тэкст. прам-сць. Нафтаперапрацоўка, суднарамонт.

**АВЕ́Н** (лац. Aries, старабел. Овень баран), адно з 13 сузор'яў задыяка ў паўн. паўшар'і неба. Астр. знак ♈ (выкарыстоўваецца для абазначэння пункта веснавога раўнадзенства). Найб. яркія зоркі 2 і 2,2 візуальнай зорнай велічыні. На тэр. Беларусі відаць з сярэдзіны лета, увосень і зімой. Гл. *Зорнае неба.*

**АВЕНА́РЫУС** Мікалай Пятровіч (12.9.1834, г. Пушкін Ленінградскай вобл. — 17.7.1903), педагог, археолаг, краязнавец. Скончыў Гал. пед. ін-т у Пецярбургу. У 1864—85 інспектар Аляксандрынска-Марыінскага ін-та ў Варшаве, Беластоцкага наст. ін-та. Адзін з заснавальнікаў Маладзечанскай наст. семінарыі (1864). У 1885—90 раскопваў курганы ў Барысаўскім і Навагрудскім пав., каменныя магілы ў Бельскім і Беластоцкім пав. Аўтар артыкулаў па археалогіі, нумізматыцы, педагогіцы, пытаннях асветы, твораў для дзяцей.

*Тв.*: Руководство к воспитанию и элементарному обучению. Варшава, 1874; Дрогичин Надбужский и его древности // Древности Северо-Западного края. Спб., 1890. Т. 1. Вып. 1.

**АВЕНА́РЫУС** Міхаіл Пятровіч (19.9.1835, г. Пушкін Ленінградскай вобл. — 16.9.1895), рус. фізік, заснавальнік кіеўскай навук. школы эксперым. фізікі. Чл.-кар. Пецярбургскай АН (1876). Скончыў Пецярбургскі ун-т (1858). У 1865—90 у Кіеўскім ун-це (з 1866 праф.). Навук. працы ў галіне тэрмаэлектрычнасці і малекулярнай фізікі. Вывеў формулу залежнасці тэрмаэлектрарухальнай сілы ад т-ры спаяў (закон А.), першым вызначыў параметры крытычнага стану для многіх рэчываў.

*Літ.*: Гольдман А.І. М.П. Авенариус и киевская школа экспериментальной физики // Успехи физ. наук. 1951. Т. 44, вып. 4.

**АВЕНА́РЫУС** (Avenarius) Рыхард (19.11.1843, Парыж — 18.8.1896), швейцарскі філосаф-ідэаліст, адзін з заснавальнікаў *эмпірыякрытыцызму*. Праф. Цюрыхскага ун-та. У цэнтры філасофіі паняцце вопыту, ачышчанага ад аб'ектыўнай рэальнасці, у выніку чаго здымаецца процілегласць свядомасці і матэрыі, псіхічнага і фізічнага. Выступаў з суб'ектыўна-ідэаліст. тэорыяй «прынцыповай каардынацыі» (без суб'екта няма аб'екта, без свядомасці — матэрыі). Прынцып «найменшай траты сіл» на чалавечае пазнанне прывёў А. да біялагізму, суб'ектывізму, агнастыцызму.

*Г.У.Грушавы.*

**АВЕНЦІ́Н** [Aventinus; сапр. Іаган Турмайр (Turmayr); 4.7.1477—9.1.1534], нямецкі гісторык-гуманіст. З 1517 баварскі прыдворны гістарыёграф. Склаў першы гіст. твор на ням. мове «Баварская хроніка», які асвятляе гісторыю Баварыі да 1519 (надрук. ў 1566). У 1523 выдаў першую карту Баварыі.

**АВЕНЮ́** (франц. avenue), шырокая вуліца, звычайна абсаджаная дрэвамі. Назва прынята ў Францыі, Вялікабрытаніі, ЗША і некаторых інш. краінах.

**АВЕРАІ́ЗМ**, кірунак у заходнееўрап. філасофіі 13—16 ст., які развіваў погляды арабскага мысліцеля 12 ст. *Ібн Рушда* (Аверроэса); натуралістычная і матэрыяліст. трактоўка вучэння *Арыстоцеля*. Асн. ідэі А.: нястворанасць свету, вечнасць матэрыі і руху, прызнанне смяротнасці чалавечай душы, сцвярджэнне ўсеагульнай прычыннай сувязі прыродных з'яў, *дзвюх ісцін тэорыя*. Гал. прадстаўнікі: Сігер Брабанцкі, Жан Жандэн, П'етра д'Абана, П.Пампанацы, Дж.Бруна і інш. У 14—16 ст. еўрап. цэнтрамі А. былі Падуанскі і Балонскі ун-ты ў Італіі. На Беларусі А. — адна з крыніц вальнадумства; Ф. *Скарына*, С. *Будны* і інш. ў сваіх творах прытрымліваліся ідэі дваістай ісціны, імкнуліся ў духу А. вызваліць чалавечы розум з-пад улады дагматычных аўтары-



Швейная машына «Аверлок».

тэтаў, зрабіць яго вышэйшым крытэрыем у зямных справах чалавека.

*Г.У.Грушавы.*

**АВЕРБА́Х** Міхаіл Іосіфавіч (29.5.1872, г. Марыупаль, Украіна — 29.7.1944), рус. афтальмолаг. Акад. АН СССР (1939). Засл. дз. нав. Расіі (1933). Скончыў Маскоўскі ун-т (1895). Адзін з заснавальнікаў Дзярж. афтальмалагічнага ін-та імя Гельмгольца (1935) і Т-ва вочных урачоў у Маскве. Працы па фізіял. оптыцы, афтальмахірургіі, прафес. пашкоджаннях вачэй, праблемах слепаты, глаўкомы, трахомы і інш. Распрацаваў і ўкараніў на практыцы шэраг аперацый на вачах. Дзярж. прэмія СССР 1943.

*Тв.*: Офтальмологические очерки. М.; Л., 1940; Главнейшие формы изменения зрительного нерва. М., 1944.

**«АВЕРБО́Т»**, 1) ступень закупленасці таварнага рынку. Пры залішняй закупленасці цэны дасягаюць вышэйшага ўзроўню і маюць тэндэнцыю да росту, пачынаецца продаж кантрактаў спекулянтамі. 2) Сітуацыя рэзкага росту цэн на які-небудзь тавар у выніку вял. аб'ёму куплі. Тэрмін «А.» часцей ужываецца ў адносінах да каштоўных папер.

**А́ВЕРКАМП** (Avercamp) Хендрык (25.1.1585, Амстэрдам — 15.5.1634), галандскі жывапісец. Стварыў жанравапейзажныя карціны, характэрныя для галандскага рэалізму пач. 17 ст., невялікія зімовыя пейзажы ў светла-серабрыстай гаме («Катанне на каньках»).

**АВЕРЛО́К** (англ. overlock), краеабкідальная швейная машына пяцельнага шыўка, дзе адна з петляў агінае край зрэзу дэталі. Выкарыстоўваецца пры пашыве вырабаў з трыкат. палатна.

**АВЕ́РНЬ** (Auvergne), гістарычная правінцыя, эканам. раён у цэнтр. ч. Францыі. Уключае дэпартаменты Канталь, Пюі-дэ-Дом, Алье, Верхняя Луара. Гад. горад Клермон-Феран. Пл. 26 тыс. км². 1,3 млн. ж. (1982). Рэльеф горны, парэзаны далінамі рэк. У сельскай гаспадарцы пераважае мясная жывёлагадоўля. У далінах вырошчваюць збожжавыя, цукр. буракі, бульбу, вінаград. З-ды па вытв-сці аўташын, станкоў, веласіпедаў, пластмас, перапрацоўцы с.-г. сыравіны (Клермон-Феран), чорная металургія (г. Манлюсон), тэкст., гарбарныя, папяровыя, сыраварныя, абутковыя прадпрыемствы. ГЭС. Курорты на базе мінер. крыніц (у т.л. *Вішы*).

**АВЕРО́ЭС**, гл. *Ібн Рушд.*

Х.Аверкамп. Катанне на каньках.

**АВЕ́РС** (франц. avers ад лац. adversus павернуты тварам), правы (галоўны) бок манеты, медаля, банкноты. А. манет, як правіла, лічыцца бок з партрэтам манарха, яго манаграмай або імем ці выявай інш. асобы (пры іх адсутнасці — з гербам або абазначэннем наміналу); на А. мемарыяльных манет змешчана сюжэтная выява; медалёў — паведамленне аб нагодзе выпуску; банкнот — герб і подпіс адказных асоб. Параўн. *Рэверс.*

**АВЕ́РСІЯ** (ад франц. aversion агіда) с е к с у а л ь н а я, адна з цяжкіх формаў сексуальнай *дысфункцыі*; стан, процілеглы *лібіда*. З'яўляецца вынікам узаемаадносін з партнёрам, які выклікае расчараванне сваімі паводзінамі, учынкамі і г.д., ці пэўнай псіхал. несумяшчальнасці партнёрскай пары.

**АВЕРСО́ЛД**, сітуацыя рэзкага зніжэння цэн на які-небудзь тавар у выніку паступлення яго ў вял. колькасці на рынак. Тэрмін часцей ужываецца ў адносінах да каштоўных папер.

**АВЕ́РЧАНКА** Аркадзь Цімафеевіч (27.3.1881, г. Севастопаль — 12.3.1925), рус. пісьменнік. З 1908 супрацоўнік, пазней рэдактар час. «Сатирикон», з 1913 рэдактар «Нового сатирикона». Аўтар зб-каў гумарыстычных апавяданняў «Вясёлыя вустрыцы» (1910), «Кругі па вадзе» (1912), «Пра добрых па сутнасці людзей» (1914), «Цуды ў рэшаце» (1915), «Пра маленькіх — для вялікіх» (1916), аповесці «Падходцаў і двое іншых» (1917), п'ес-мініяцюр, у якіх высмейваў заганы абываценяў. Пасля 1917 у эміграцыі, дзе выдаў кн. апавяданняў «Тузін нажоў у спіну рэвалюцыі» (1921), раман «Жарт мецэната» (1925).

*Тв.*: Собр. соч. Т. 1—4. Спб., 1911—14; Юмористические рассказы. М., 1964.

**АВЕ́РЧАНКА** Мікалай Іванавіч (18.12.1922, в. Майсеенкі Гарадоцкага р-на Віцебскай вобл. — 4.7.1960), Герой Сав. Саюза (1946). У Вял. Айч. вайну з чэрв. 1941 на Паўд.-Зах., Закаўказскім, Паўн.-Каўказскім, 3-м і 4-м Укр., 1-м Бел. франтах. Камандзір гарматы ст. сяржант А. вызначыўся пры фарсіраванні рэк Одэр і Шпрэе ў баях за Берлін 14—27.4.1945.

**АВЕ́РЫНА** Наталля Георгіеўна (н. 18.10.1942, Ташкент), бел. біёлаг. Д-р біял. н. (1991). Скончыла БДУ (1966). З 1961 у Ін-це фотабіялогіі АН Беларусі. Навук. працы па малекулярнай біяфізіцы і біяхіміі фотасінтэтычных мембран, біягенезе фотасінтэтычнага апарату і яго рэгуляцыі.

*Тв.*: Биогенез пигментного аппарата фотосинтеза. Мн., 1988 (у сааўт.).

**АВЕ́РЫНЦАЎ** Сяргей Сяргеевіч, (н. 10.12.1937, Масква), рус. вучоны-філолаг, літаратуразнавец, перакладчык. Чл.-кар. Рас. АН (1987), акад. Рас. акадэміі прыродазнаўчых навук. Скончыў Маскоўскі ун-т (1961). Працаваў у Ін-це гісторыі мастацтваў; з 1969 у Ін-це сусв. л-ры імя Горкага. Працы па гісторыі познаантычнай і сярэдневяковай л-ры; па зах. філасофіі культуры 20 ст. Аўтар вершаваных і празаічных перакладаў («Кніга Іова», творы Платона, Калімаха, Плутарха, Гёльдэрліна, Тракля, Гесэ і інш.). Адзін з аўтараў энцыклапедыі «Міфы народаў свету» (Т. 1—2, 1987—88). Дзярж. прэмія СССР.

*Тв.*: Плутарх и античная биография. М., 1973; Поэтика ранневизантийской литературы. М., 1977.

**«АВЕ́СТА»**, збор свяшчэнных кніг *зараастрызму* ў некаторых стараж. народаў Ірана, Сярэдняй Азіі, Азербайджана і Афганістана. Узнікла, верагодна, у 1-й пал. 1-га тыс. да н.э., агульнапрызнаным канонам стала ў 3—7 ст. Напісана на стараж.-іранскіх дыялектах. Складаецца з рэліг. прадпісанняў, малітваў, гімнаў, мае шмат міфічных элементаў. Выкарыстоўваецца ў богаслужэнні парсаў (Індыя). Раннія часткі А. прыпісваюцца прароку *Заратуштры* (Зараастру).

Авёс: *1* — пасяўны; *2* — шчаціністы.

**АВЕ́ЧКА** с в о й с к а я, парнакапытная жвачная жывёла роду бараноў сям. пустарогіх. Аб'ект *авечкагадоўлі*. Паходзіць ад дзікіх горных бараноў (муфлонаў і архараў), прыручаных больш як 8 тыс. гадоў назад. На тэр. Беларусі вядома больш за 1000 гадоў. Дае каштоўную сыравіну (воўну, смушак, аўчыну) і прадукты (мяса, лой, малако). У свеце больш за 600 парод і генетычна адасобленых груп А. Па якасці воўны адрозніваюць танкарунныя, паўтанкарунныя, паўгрубашэрсныя і грубашэрсныя пароды А.; паводле экстэр'еру — каротка- і доўгахудахвостыя, каротка- і доўгатлустахвостыя, курдзючныя; паводле прадукцыйнасці і вытв. кірунку — смушкавыя, аўчынна-футравыя, мясавоўнавыя і мяса-воўна-малочныя. У гаспадарках Беларусі найбольш пашыраны пароды прэкас, латвійская цёмнагаловая, раманаўская.

Масць А. белая, чорная, рыжая, шэрая. Вышыня ў карку 55—100 см, даўж. цела 60—110 см. У самцоў звычайна развітыя, спіральна выгнутыя рогі, маткі бязрогія або з невялікімі рагамі. А. жыве 12—15 гадоў, тэрмін гасп. выкарыстання 6—8 гадоў. Плоднасць 1—2 ягнят за акот. Выхад чыстай воўны 30—75%, малочнасць матак 50—100 кг. Дарослыя бараны важаць 60—180, маткі — 35—110 кг. Забойны выхад 45—60%. Асн. кармы для А. — трава з прыроднай і сеянай пашы, сена, яравая салома, сілас і канцэнтраты.

**АВЕЧКАГАДО́ЎЛЯ**, галіна *жывёлагадоўлі* па развядзенні *авечак*. Дае сыравіну для лёгкай прам-сці (воўну, аўчыну, смушак) і харч. прадукты (бараніну, лой, малако). Найб. каштоўная сыравіна — тонкая і паўтонкая воўна, з якой вырабляюць шарсцяныя тканіны. У свеце існуюць дзесяткі парод іародных груп авечак. А. мае шэраг кірункаў: танкарунны, паўтанкарунны, паўгрубашэрсны і грубашэрсны, апошні падзяляецца на смушкавы, футравы, мяса-воўнавы, мяса-воўна-малочны, мяса-сальны.

У краінах Еўропы гадуюць пераважна паўтанкарунныя пароды авечак (Вялікабрытанія, Ірландыя, Нарвегія, Данія, Балгарыя) і танкарунныя (Францыя, Румынія, Венгрыя і інш.). У Кітаі і Манголіі пераважаюць грубашэрсныя пароды. У краінах Сярэдняй Азіі, Афганістане і Паўд. Афрыцы развіта каракуляводства. У Аргенціне пераважаюць паўтанкарунныя авечкі, ва Уругваі — красбрэды, у ЗША — авечкі тыпу англ. каракашэрсныя. Найб. пагалоўе авечак сканцэнтравана ў Аўстраліі, Аргенціне, Новай Зеландыі, Уругваі, ЗША і ПАР (больш за 50% сусв. вытв-сці воўны). У краінах СНД асн. раёны А. — Паўн. Каўказ, Паволжа, Украіна, Казахстан, Сярэдняя Азія і Закаўказзе. Па колькасці авечак і вытв-сці воўны 1-е месца ў свеце займае Аўстралія, па экспарце бараніны і вытв-сці найб. высакаякаснай красбрэднай воўны — Новая Зеландыя, дзе амаль уся А. мяса-воўнавых і паўтанкарунных парод.

На Беларусі А. сталі займацца ў пач. 18 ст. Гадавалі пераважна грубашэрсных нізкапрадукцыйных авечак. У 1913 танкарунных авечак (мерыносаў) было толькі 6% ад агульнага пагалоўя. Паляпшэнне племянных і прадукцыйных якасцей авечак пачалося ў даваен. гады. Планавыя пароды — прэкас, латвійская цёмнагаловая і раманаўская. У гаспадарках рэспублікі А. — дадатковая галіна жывёлагадоўлі. Пераважае мясавоўнавая А. Пагалоўе авечак па шэрагу прычын, у асн. эканам. характару, паступова змяншаецца. На пач. 1985 ва ўсіх гаспадарках было 640,2 тыс. авечак, у 1900 — 475,5, у 1994 — 271,3 тыс.

*Г.П.Астапенка, Я.М.Сапільнікаў.*

**АВЕ́ЧКІН** Валянцін Уладзіміравіч (22.6.1904, г. Таганрог — 27.1.1968), рус. пісьменнік. Асн. тэма творчасці — жыццё вёскі. Аўтар аповесці «З франтавым прывітаннем» (1945), нарысаў «Раённыя будні» (цыкл, 1952—56), «На пярэднім краі» (1953); п'ес «Бабіна лета» (1947), «Насця Коласава» (1949), «Насустрач ветру» (1958).

*Літ.*: Воспоминания о В.Овечкине. М., 1982.

**АВЁС** (Avena), род аднагадовых травяністых раслін сям. злакаў. Каля 30 відаў, пашыраных у Еўразіі, Паўн. Афрыцы, Амерыцы, Аўстраліі. Кармавыя травы, збожжавыя культуры, ёсць

пустазельныя віды. На Беларусі культывуецца А. пасяўны яравы і азімы (каштоўная харч. і кармавая культура; вядомы з 7 ст. н.э.), 2 віды — А. шчаціністы і аўсюк — дзікарослыя (пустазелле ў пасевах яравых культур).

А. пасяўны — вільгацелюбівая, непатрабавальная да цяпла расліна. Вегетац. перыяд 85—115 сут. Самаапыляльнік. Лепшыя глебы — дзярнова-падзолістыя, супясчаныя і лёгкасугліністыя з добрай аэрацыяй. Пасяўная пл. ў рэспубліцы 309 тыс. га (1993); сярэдняя ўраджайнасць 2,3—2,5, макс. — 7 т/га. Высяваецца на корм у сумесі з лубінам, вікай, гарохам і інш. культурамі. Асн. зернефуражная культура. Пажыўнасць 1 кг зерня А. прынята за кармавую адзінку. Раянаваныя сарты: Эрбграф, Буг, Асілак. Асн. шкоднікі А. пасяўнога: шведская муха, збожжавыя блохі, тля, злакавыя трыпсы; хваробы: іржа, галаўня, бактэрыёз, мучністая раса.

*Літ.*: Митрофанов А.С., Митрофанова К.С. Овёс. 2 изд. М., 1972.

**АВЁС ПУСТЫ́**, тое, што *аўсюк*.

**АВІ́ДЗІЙ** (Ovidius), Публій Авідзій Назон (20.3.43 да н.э., г. Сульмона, недалёка ад Рыма — каля 18 н.э.), рымскі паэт. Ранніе творы: зб-кі «Любоўныя элегіі», «Гераіні», жартоўна-парадыйныя паэмы «Майстэрства кахання», «Сродкі ад кахання». У паэме «Фасты» (незавершаная) тлумачыў паходжанне рымскіх святаў і абрадаў. Найб. вядомы твор «Метамарфозы» — маст. апрацоўка грэка-рымскіх міфаў пра пераўвасабленні людзей і багоў у жывёл, сузор'і і інш. — складаецца з асобных вершаваных навел. У 8 н.э. сасланы Аўгустам у г. Томы (цяпер Канстанца ў Румыніі), дзе напісаў поўныя тугі па радзіме «Сумныя элегіі» і «Пісьмы з Понта». Творчасць А. значна паўплывала на развіццё зах.-еўрап. л-ры. Дзве навелы з «Метамарфозаў» на бел. мову пераклаў М.Багдановіч.

*Тв.*: Рус. пер. — Элегии и малые поэмы. М., 1973; Любовные элегии. Метаморфозы. Скорбные элегии. М., 1983.

**АВІ́ДНАСЦЬ** (ад лац. avidus прагны), уласцівасць *антыгенаў* і *антыцел*, якая вызначае энергію звязвання камплементарных участкаў іх малекул; асн. характарыстыка імунных сываратак. Праяўляецца ў трываласці створаных комплексаў антыгенаў-антыцел. А. імуннай сываткі залежыць ад спецыфічнасці антыцел, якія ёсць у ёй. Гл. таксама *Камплементарнасць*.

**АВІЕ́ТКА** (франц. aviette), *самалёт* малой магутнасці, звычайна 1—2-месны.

**АВІ́ЖУС** (Avyzius) Йонас (н. 16.5.1922, в. Медгінай, Літва), літоўскі пісьменнік. Нар. пісьменнік Літвы (1986). Аўтар кн. нарысаў «Першыя барозны» (1948), зб-каў апавяданняў і аповесцяў «Спадчына» (1949), «Людзі і падзеі» (1954), «Буткус Мсцівец» (1957), «Чалавек застаецца чалавекам» (1960), раманаў «Шкляная гара» (1961), «Вёска на раздарожжы» (1964), «Страчаны прытулак» (1970, Ленінская прэмія 1976), «Колеры хамелеона» (1976), «Дзягімай» (1981). Асн. тэмы — жыццё літ. вёскі, падзеі Вял. Айч. вайны, маральна-этычныя праблемы сучаснасці.

**АВІ́ЗА** (італьян. avviso), паведамленне (пісьмо) атрымальніку аб адгрузцы яму прадукцыі, пераводзе грашовых сродкаў ці аб зменах ва ўзаемных разліках паміж контрагентамі. У банкаўскай, камерцыйнай, бухгалтарскай практыцы А. — афіцыйнае паведамленне аднаго контрагента другому аб выкананні разліковых аперацый. Банкі высылаюць А. сваім карэспандэнтам і кліентам пра дэбетавыя і крэдытавыя запісы, рэшту сродкаў на рахунках і інш. разліковыя аперацыі.

**АВІ́ЗМ** (ад лац. ovum яйцо), кірунак у біялогіі 17—18 ст., прадстаўнікі якога (авісты; італьян. вучоныя М.Мальпігі і А.Валіснеры, швейцарскія Ш.Банэ і А.Галер і інш.) лічылі, што ў жан. палавой клетцы (яйцы) ёсць дарослы арганізм у мікраскапічным выглядзе, развіццё яго зводзіцца толькі да павелічэння ў памерах. Быў больш пашыраны, чым *анімалкулізм*, і з'яўляўся адным з цячэнняў у вучэнні аб прэфармацыі (гл. *Прэфармізм*).



Арачны мост у г. Авіла.

**АВІКУЛЯ́РЫЯ**, гл. ў арт. *Імшанкі*.

**А́ВІЛА** (Avila), горад у Іспаніі, на Пд аўт. вобласці Кастылія-Леон. Адм. ц. правінцыі Авіла. 46 тыс. ж. (1991).

У старажытнасці фінікійская, пасля рымская калонія. У 8 ст. заваявана арабамі, у 11 ст. адваявана хрысціянамі і стала аб'ектам дынастычнай барацьбы паміж *Арагонам* і *Кастыліяй*. У 1482—1808 у А. быў ун-т. Горад захаваў сярэдневяковую і рэгулярную планіроўку, жылыя дамы 13 ст., умацаваныя палацы 15—16 ст., гранітныя гар. сцены 11 ст., раманска-гатычны сабор (12—14 ст.), цэрквы (12—15 ст.), манастыр (1636) і інш.

Й.Авіжус.

**АВІ́ЛАЎ** Міхаіл Іванавіч (18.9.1882, Санкт-Пецярбург — 14.4.1954), рус. жывапісец. Нар. мастак Расіі (1953), правадз. чл. АМ СССР (1947). Вучыўся ў АМ у Пецярбургу (1904—13). З 1923 чл. Асацыяцыі мастакоў рэв. Расіі. Працаваў пераважна ў батальным жанры: «Сібірскія партызаны», «Прарыў польскага фронту Першай коннай арміяй у 1920 годзе», «Паядынак Перасвета з Чалубеем» (Дзярж. прэмія СССР 1946) і інш.

**АВІНЬЁН** (Avignon), горад на ПдУ Францыі, у Правансе. Порт на рэках Рона і Дзюранс. Адм. ц. дэпартамента Ваклюз. 181 тыс. ж. (з прыгарадамі; 1990). Металаапр., тэкст. (пераважна шаўковая), харч., абутковая прам-сць. Трансп. вузел і цэнтр с.-г. раёна (вінаградарства, садоўніцтва, агародніцтва, кветкаводства).

А. узнік на месцы заснаванай рымлянамі ў 48 г. да н.э. калоніі Авенія. Пасля падзення Зах. Рымскай імперыі А. пад уладай бургундцаў, вестготаў, франкаў, у 730 і 737 разбураны

М.Авіхаў. Паядынак Перасвета з Чалубеем. 1943.

сарацынамі. У сярэднявеччы ч. каралеўства Бургундыя, належаў графам Тулузскім і Праванскім. У 1226 разбураны франц. каралём Людовікам VIII. У 1309—77 месца вымушанага знаходжання рымскіх папаў, у 1348—1791 (афіц. 1797) — папскае ўладанне. У 1797 А. далучаны да Францыі. У 14 ст. адзін з буйных маст. цэнтраў Еўропы. Аблічча А. ў многім вызначаюць будынкі 14 ст., кальцо гар. умацаванняў з зубчастымі сценамі, прамавугольнымі вежамі, варотамі. Над радыяльнай сеткай вуліц сярэдзіны 18 ст. з дамамі 19—20 ст. дамінуе раманскі сабор Нотр-Дам-дэ-Дом (12 ст.) з грабніцамі папаў; побач гатычны папскі палац з высокімі сценамі і вежамі (14 ст.; у інтэр'еры фрэскі 14—15 ст.), епіскапскі Малы палац (15 ст., рэнесанс). Захаваліся частка моста Сен-Бенезэ (12—13 ст.), гатычныя цэрквы 14 ст., атэлі і цэрквы 15—18 ст. Музей скульптуры. У музеі Кальвэ (засн. ў 1810) жывапіс авіньёнскай школы 14—16 ст.

*Літ.*: Berenguier R. Avignon. Paris, [1973].

**АВІНЬЁНСКАЕ ПАЛАНЕ́ННЕ ПА́ПАЎ**, «вавілонскі палон», перыяд у гісторыі папства, калі рымскія папы трапілі ў паліт. залежнасць ад франц. караля і вымушаны былі перанесці сваю рэзідэнцыю ў 1309—77 (з перапынкам 1367—70) з Рыма ў Авіньён (Францыя). Сведчыла пра паражэнне папства ў барацьбе з феад. манархіямі Еўропы за паліт. ўплыў.

**АВІ́СКАЯ ДЫНА́СТЫЯ** (Aviz, Avis), дынастыя партуг. каралёў [1385—1580]. Заснавальнік Жуан I. Каралі А.д. праводзілі палітыку абмежавання феад. знаці. Прадстаўнікі: Жуан I [1385—1433], Дуарці I [1433—38], *Альфонс V* [1438—81], Жуан II [1481—95], Мануэл I [1495—1521], Жуан III [1521—57], Себасцьян I [1557—79], Энрыкі I [1578—80]. Пасля спынення А.д. прастол у Партугаліі захоплены ісп. каралём Філіпам II і ўстаноўлена дынастычная унія Партугаліі і Іспаніі.

**АВІ́СКІ О́РДЭН**, партугальскі духоўна-рыцарскі ордэн. Існаваў у 1162—1789. Утвораны з вайск. арг-цыі, заснаванай у 1147 ці 1148 для барацьбы з маўрамі. Партуг. кароль Альфонс I у 1162 ці 1166 падараваў ордэну крэпасць Авіс (адсюль назва). А.о. адыграў значную ролю ў гісторыі *Рэканкісты* ў Партугаліі.

**АВІТАМІНО́З** $B_1$, гл. *Беры-беры*.

**АВІТАМІНО́ЗЫ** (ад *а...* + *вітаміны*), група захворванняў, якія развіваюцца пры працяглай адсутнасці вітамінаў у ежы, парушэнні іх засваення або прыгнечанні сінтэзу ў арганізме. Недахоп вітамінаў можа ўзнікнуць у зімова-вясновы перыяд, пры вял. фіз. нагрузках, інфекцыйна-вірусных захворваннях, з узростам. Пры працяглым недахопе або адсутнасці вітаміну С развіваецца *цынга*, $B_1$ — *беры-беры*, D — *рахіт*, PP — *пелагра*. Часцей сустракаецца адначасовая недастатковасць некалькіх вітамінаў — поліавітаміноз. Прафілактычныя меры: ужыванне вітамінных прэпаратаў, вітамінізацыя ежы, правільнае захоўванне і кулінарная апрацоўка харч. прадуктаў.

Грузавы аўтамабіль «Авія».

**АВІФА́УНА** (ад лац. avis птушка + *фауна*), тое, што *арнітафауна*.

**АВІЦЫ́ДЫ** [ад лац. ovum яйцо + ...цыд(ы) знішчаю], хімічныя рэчывы, якія згубна дзейнічаюць на яйцы насякомых і кляшчоў. Гл. *Пестыцыды*.

**АВІЦЭ́НА**, гл. *Ібн-Сіна* Абу Алі.

**А́ВІЯ** ... (ад лац. avis птушка), першая састаўная частка складаных слоў, скарачэнне, якое абазначае «авіяцыйны», «паветраны», напр., *авіямадэлізм*, *авіялінія*.

**«А́ВІЯ»** (Avia), грузавыя аўтамабілі, якія выпускаюцца ў Чэхіі (Прага) з 1968 па ліцэнзіі франц. фірмы «Савіем». Грузападымальнасць 1,8—3,1 т, магутнасць дызельных рухавікоў 53—61 кВт, маса 4—6 т. Мае шэраг мадыфікацый.

**АВІЯГАРЫЗО́НТ**, пілатажна-навігацыйная прылада, якая паказвае становішча падоўжнай і папярочнай восяў лятальнага апарата адносна сапраўднага гарызонта. Асн. часткі А.: гіраскоп, які захоўвае нязменнае становішча сваёй восі ў прасторы, і маятнікавая сістэма карэкцыі, якая ліквідуе адхіленні восі ротара гіраскопа ад праўдзівай вертыкалі.

**АВІЯКАМПА́НІЯ**, авіятранспартнае прадпрыемства, якое ажыццяўляе міжнар. і ўнутр. паветраныя зносіны. У 1993 у краінах свету было 660 А. па перавозцы пасажыраў (перавезены 1171 млн. чал.) і 60 па перавозцы грузаў (перавезена каля 18 млн. т). Сярод А. найбольшыя: «Юнайтэд», «Амерыкан», «Дэльта», «Нортуэст» (усе ЗША), «Брытыш эруэйз» (Вялікабрытанія), «Люфтганза» (Германія), ДЖАЛ (Японія), «Эр Франс» (Францыя), «Аэрафлот» (Расія). Найб. А. ў *паветраным транспарце* Рэспублікі Беларусь «Белавія». *А.В.Жураўскі.*

**АВІЯКО́МПАС**, аэранавігацыйная прылада, якая паказвае курс лятальнага апарата адносна магн. і геагр. мерыдыянаў, зададзенага напрамку ці напрамку на радыёмаяк. Бываюць магнітныя, гіраіндукцыйныя, астранамічныя. Гл. таксама *Радыёкомпас*.

**АВІЯЛІ́НІЯ**, авіятраса, паветраная лінія, зацверджаны маршрут рэгулярных палётаў пасаж. і грузавых самалётаў, верталётаў паміж вызначанымі пунктамі з адпаведнай яму прасторай над паверхняй зямлі (паветр. калідорам), у межах якой ажыццяўляецца палёт. Адрозніваюць А. міжнародныя і ўнутраныя, у т.л. магістральныя і мясцовыя. А. забяспечваюцца аэрадромамі, наземнымі радыёнавігацыйнымі пунктамі, сродкамі кантролю і кіравання паветр. рухам. Гл. таксама *Паветраны транспарт*.

**АВІЯ́ЛЬ**, авіяцыйны алюміній, сплаў на аснове *алюмінію*. Мае ў сабе (у %) 0,45—0,9 магнію, 0,5—1,2 крэмнію, 0,2—0,6 медзі, 0,15—0,35 марганцу ці хрому. Высокапластычны, каразійнаўстойлівы, здавальняючай мех. трываласці (павышаецца гартаваннем і штучным старэннем), добра паліруецца. Ідзе на выраб складаных па форме прасаваных і штампаваных дэталяў (лопасцяў вінтоў верталётаў, элементаў буд. канструкцый і інш.).

**АВІЯМАДЭЛІ́ЗМ**, авіямадэльны спорт, канструяванне, выраб і запуск мадэляў лятальных апаратаў (у т.л. ракет) у спарт. мэтах; адзін з

Панарама Авіньёна.

*тэхнічных відаў спорту*. Асн. класы маделяў: свабоднага палёту (безматорныя, гумаваматорныя, з поршневымі ці рэактыўнымі рухавікамі); кордавыя (кіруюцца з дапамогай тонкай стальной ніткі ці троса); радыёкіроўныя; лятальныя мадэлі (копіі апаратаў). Чэмпіянаты свету праводзяцца з 1925 на скорасць, далёкасць, вышыню, працягласць палёту, на выкананне мадэлямі фігур найвышэйшага пілатажу. Рэкорды рэгіструюцца Міжнар. авіяц. федэрацыяй (ФАІ). На Беларусі развіваецца з 1926, чэмпіянаты праводзяцца з 1953; кіраванне А. ажыццяўляе Бел. абароннае спарт.-тэхн. таварыства.

**АВІЯНО́СЕЦ**, баявы надводны карабель, асн. ўдарная сіла якога — палубныя самалёты і верталёты. Упершыню выкарыстаны ў канцы 1-й сусв. вайны. У 2-ю сусв. вайну складалі аснову флоту ЗША, Вялікабрытаніі, Японіі і Францыі. Найб. развіццё атрымалі ў ЗША. Паводле водазмяшчэння і прызначэння адрозніваюць А.: лёгкія, цяжкія; мнагамэтавыя, процілодачныя, ударныя, эскортныя; звычайныя і атамныя. Водазмяшчэнне сучасных А. 20—100 тыс. т, скорасць 18—35 вузлоў (33,3—64,8 км/гадз). Нясуць 25—100 самалётаў і верталётаў, якія пад'ёмнікамі падаюцца на палётную палубу і апускаюцца ў ангар, дзе абсталяваны месцы для рамонту і падрыхтоўкі іх да вылету. На палубе размешчаны катапульты (забяспечваюць узлёт з інтэрвалам 30 с), пасадачная паласа на вуглавой палётнай палубе з аэрафінішорам і аварыйным бар'ерам (нейлонавыя сеткі). Узлёт і пасадка забяспечваюцца спец. радыётэхн. і аптычнымі сістэмамі і індыкатарамі. Для самаабароны выкарыстоўваюцца зенітныя ракетныя і арт. комплексы.

**АВІЯЦЫ́ЙНАЯ ПРАМЫСЛО́ВАСЦЬ**, галіна машынабудавання, спецыялізаваная на выт-сці лятальных апаратаў, авіяц. рухавікоў, бартавых і інш. сістэм і абсталявання для *авіяцыі*. Адна з самых навукаёмістых галін прам-сці з высокай ступенню кааперавання і канцэнтрацыі выт-сці. Узнікла ў пач. 20 ст. Як буйная галіна прам-сці развілася ў перыяд 1-й і асабліва 2-й сусв. войнаў. Масавая выт-сць авіяц. тэхнікі пачалася ў 1918. Толькі ў ЗША і Вялікабрытаніі было выпушчана больш за 36 тыс. самалётаў і 54 тыс. авіярухавікоў (1918). Паскоранымі тэмпамі развівалася напярэдадні і ў час 2-й сусв. вайны. А.п. СССР забяспечыла фронт баявымі і трансп. самалётамі пераважна новых тыпаў (знішчальнікі С.А.Лавачкіна, А.І.Мікаяна, А.С.Якаўлева, штурмавікі С.У.Ільюшына, бамбардзіроўшчыкі Ільюшына, У.М.Петлякова, А.М.Тупалева). Выпуск самалётаў у СССР склаў у 1941—1-й пал. 1945 больш за 125,6 тыс. За перыяд 2-й сусв. вайны Англія выпусціла 125 тыс., Германія каля 120 тыс., ЗША каля 300 тыс. самалётаў. У пасляваен. гады А.п. асвоіла выпуск рэактыўных самалётаў са звышгукавымі скарасцямі. З пач. 1950-х г. пачаўся выпуск грамадз. рэактыўных самалётаў. Развівалася верталётабудаванне: верталёты канструкцыі М.Л.Міля, М.І.Камава (СССР), І.І.Сікорскага (ЗША) і інш. У 1960—80-я г. ў А.п. СССР быў створаны шэраг прынцыпова новых узораў авіяц. тэхнікі: знішчальнікі са зменлівай стрэлападобнасцю крылаў, паскораных узлёту і пасадкі, звышгукавы бамбардзіроўшчык канструкцыі П.В.Сухога Су-24, штурмавік Су-25, знішчальнікі МіГ-29, МіГ-31, Су-27 і інш.; велікагрузныя транспартныя самалёты Іл-76Г, АН-124, «Руслан», АН-225, «Мрыя» (канструктарскае бюро А.К.Антонава), баявыя і трансп. верталёты (у т.л. Мі-26 з найбольшай у свеце грузападымальнасцю — 20 т) і інш. У 1960-я г. А.п. развітых краін распрацавала праграмы выт-сці звышгукавых пасаж. самалётаў «Канкорд» (Францыя сумесна з Англіяй), Ту-144 (СССР), які прайшоў выпрабавальную эксплуатацыю. У 1970-я г. з'явіліся шырокафюзеляжныя пасаж. самалёты-аэробусы А300, А310, А320 і інш. сумеснай выт-сці Францыі, Вялікабрытаніі і інш. зах.-еўрап. краін (у кансорцыуме «Эрбас індастры»), Іл-86 (СССР). Вырашана шмат навук.-тэхн. праблем, атрыманы каштоўныя тэхналогіі пры стварэнні арбітальных апаратаў шматразовага выкарыстання «Спэйс Шатл» (ЗША) і «Буран» (СССР), экранапланаў (ракетаносны эксперым. экранаплан «Лунь», СССР; даўж. 73 м, вага да 300 т) і інш. У канцы 1980-х г. у СССР пачаліся падрыхтоўка і асваенне серыйнай выт-сці самалётаў новага пакалення з высокай эканоміяй паліва — Іл-96—300, Ту-204, Іл-114, пад'ёмных, пад'ёмна-маршавых, турбінных рухавікоў і інш. З краін б. СССР найб. развіта А.п. у Рас. Федэрацыі. У Рэспубліцы Беларусь дзейнічаюць Мінскі авіярамонтны з-д (рамантуе самалёты ТУ-134, Як-40, Як-42), авіярамонтныя з-ды ў Баранавічах і пад Оршай, Мінскі дзярж. авіяц. каледж (рыхтуе спецыялістаў для грамадз. і ваен. А.). Распрацавана праграма стварэння ўласнага пасаж. самалёта ў кааперацыі з Рас. Федэрацыяй (1994).



**Авіямадэлізм.** Авіямадэлі: *1* — пілатажная радыёкіроўная; *2* — экраналёт.

Сусветны лідэр у А.п. — ЗША, дзе А.п. вядзе пачатак ад майстэрняў братоў Райт. Масавая выт-сць самалётаў разгорнута ў 1918. Інтэнсіўны рост пачаўся ў 1936. У 1939 выпушчана каля 3,9 тыс. самалётаў, у 1944 больш за 96 тыс. Пасля 2-й сусв. вайны ЗША сталі буйнейшым экспарцёрам ваен. тэхнікі, з канца 1950-х г. — грамадзянскай авіяц. тэхнікі. У 1960-я г. А.п. ЗША ператварылася ў авіяракетную прам-сць. У 1970-я г. ажыццяўляліся буйныя праграмы выт-сці баявых самалётаў, створаны авіясістэма сачэння і навядзення («АВАКС»), касм. карабель «Спэйс Шатл», наладжана буйнасерыйная выт-сць шырокафюзеляжных пасаж. самалётаў і інш. Па праграмах 1980-х г. ажыццяўляліся выт-сць знішчальнікаў F-15, F-16, F-18 і інш., стратэг. бамбардзіроўшчыка B-1B, распрацоўка малапрыкметнага стратэг. бамбардзіроўшчыка B-2, знішчальніка АТ і інш., вы-



Мнагамэтавы **авіяносец** ВМС Францыі «Клемансо».

пуск пасаж. самалётаў «Боінг» 727, 737, 747, 757, 767, L-1011, DC-9 і DC-10, MD-80 і інш. Вядучыя самалёта- і верталётабуд. фірмы: «Боінг», «Мак-Донел-Дуглас», «Локхід», «Рокуэл», «Джэнерал дайнэмікс», «Груман», «Нортрап», «Х'юз гелікаптэрс» і інш.; фірмы—вытворцы рухавікоў: «Джэнерал электрык», «Прат энд Уітні», «Аўка Лайкамінг», «Алісан», «Гарэт тэрбін энджын». Высокаразвітая А.п. у Англіі, Францыі, ФРГ, Канадзе, Японіі і інш. індустрыяльных краінах. Вядучыя еўрап. краіны аб'ядноўваюць сумесныя праграмы распрацоўкі і выт-сці грамадз. і ваен. авіятэхнікі новага пакалення, у т.л. і паветрана-касм. самалёта. Пашыраецца міжнар. кааперацыя паміж авіяц. фірмамі розных краін і кантынентаў. На мяжы 1980—90-х г. кошт гадавой прадукцыі А.п. замежных краін (без б. СССР) ацэньваўся амаль у 160 млрд. дол. (з улікам прадукцыі ракетна-касм. сектара).

*Літ.*: Гл. пры арт. *Авіяцыя.*

**АВІЯЦЫ́ЙНЫ РУХАВІ́К**, цеплавы рухавік для забеспячэння палётаў лятальных апаратаў у каляземнай паветр. прасторы. Асн. тыпы А.р.: *паветрана-рэактыўныя рухавікі* (пераважна *турбарэактыўныя рухавікі*), *турбавінтавыя рухавікі* і поршневыя бензінавыя (устанаўліваюцца на самалётах грамадз. авіяцыі спец. прызначэння).

Да кампрэсарных паветрана-рэактыўных А.р. адносяцца *газатурбінныя рухавікі* прамой і непрамой рэакцыі (у т.л. турбавальныя, якія выкарыстоўваюцца ў асн. на верталётах). На самалётах пакарочанага, а таксама верт. ўзлёту і пасадкі прымяняюць пад'ёмныя і універсальныя пад'ёмна-маршавыя газатурбінныя рухавікі. На самалётах, здольных развіваць звышгукавыя скорасці, устанаўліваюць бескампрэсарныя праматочныя паветрана-рэактыўныя рухавікі ці змешаныя ўстаноўкі. Ёсць таксама пульсавальныя паветрана-рэактыўныя, вадкасна-ракетныя і *паветрана-ракетныя рухавікі.* А.р. аснашчаюць аўтам. сістэмамі, што аблягчае кіраванне імі, павышае іх эксплуатацыйную надзейнасць. Асн. паказчыкі дасканаласці А.р.: удз. вага (адносіны вагі рухавіка да яго ўзлётнай цягі ці магутнасці) і ўдз. расход паліва (адносіны гадзіннага расходу паліва да крэйсерскай цягі ці магутнасці).

**АВІЯЦЫ́ЙНЫ СПОРТ**, агульная назва відаў спорту, звязаных з выкарыстаннем лятальных апаратаў. Уключае *верталётны спорт, дэльтапланёрны спорт, парашутны спорт, планёрны спорт, самалётны спорт.*

**АВІЯ́ЦЫЯ** (франц. aviation ад лац. avis птушка), тэорыя і практыка палётаў у каляземнай паветр. прасторы на апаратах, цяжэйшых за паветра; арганізацыя (служба), якая выкарыстоўвае для палётаў такія апараты. Адрозніваюць *грамадзянскую авіяцыю* (трансп., сан., спарт., спец. прызначэння і інш.) і ваенную (*ваенна-паветраныя сілы, марская авіяцыя*, ППА). Для забеспячэння руху па *авіялініях* грамадз. А. мае: парк *самалётаў* і *верталётаў*; *аэрадромы* і *аэрапорты*; службы кіравання палётамі. Асн. абсталяванне лятальных апаратаў: *авіяцыйныя рухавікі* і *паветраныя вінты*; электрамех., гідраўл. і пнеўматычныя прыстасаванні для забеспячэння ўзлёту, пасадкі, кіравання; авіяц. прыборы і сістэмы (*паветранай скорасці ўказальнік, вышынямер, авіягарызонт, аўтапілот, авіякомпас, гіраскапічныя прыстасаванні* і інш.); сродкі *навігацыі паветранай*, электронікі, выліч. тэхнікі і г.д. *Самалётаваджэнне* забяспечваюць таксама наземныя сродкі: радыёстанцыі, радыёмаякі, радыёлакацыйныя станцыі, святломех. кодавыя і сігнальныя агні. А. развіваецца дзякуючы навук. даследаванням у галінах *аэрадынамікі, газавай дынамікі, балістыкі*, тэорыі рухавікоў і інш.

Развіццё А. пачалося з *паветраплавання.*



Да арт. **Авіяцыя.** Самалёты: *1* — А.Ф.Мажайскага; *2* — братоў Райт; *3* — «Ілья Мурамец».

Да арт. **Авіяцыя.** Самалёты перыяду 2-й сусветнай вайны: *4* — Іл-2; *5* — Як-3; *6* — МіГ-3; *7* — Ла-7; *8* — Пе-8; *9* — Ме-109 (Германія).

Франц. марак Ле Бры ў 1857—67 ажыццявіў палёты на пабудаваным ім *планёры*, ням. інжынер О.Ліліенталь у 1891—96 пабудаваў і выпрабаваў некалькі планёраў. Рус. вынаходнік А.Ф.*Можайскі* ў 1881 атрымаў першы патэнт на самалёт, абсталяваны парасілавой установкай. Упершыню ў 1890 адарваўся ад зямлі самалёт з паравым рухавіком франц. інжынера К.Адэра. У 1903 падняліся ў паветра на самалёце з рухавіком унутр. згарання амер. вынаходнікі браты У. і О.Райт. З 1906 будаваў самалёты франц. інжынер Л.*Блерыо*, які ўпершыню (1909) пераляцеў Ла-Манш. У 1909—14 у Расіі распрацаваны самалёты канструкцыі Я.М.Гакеля, Дз.П.Грыгаровіча і інш. Палёт на *біплане* ўласнай канструкцыі ў 1910 ажыццявіў А.С.Кудашаў (Кіеў). Прыярытэт у канструяванні верталёта (1909) належыць І.І.*Сікорскаму*, па яго праекце ў 1913 пабудаваны самалёт-біплан «Рускі віцязь» з 4 рухавікамі па 100 к.с. (удасканаленай канструкцыяй гэтага самалёта быў «Ілья Мурамец»). Тэорыю верталёта ў 1910—12 распрацаваў рус. інжынер Б.М.Юр'еў. Вялікі ўплыў на развіццё А. зрабілі працы М.Я.*Жукоўскага* і С.А.*Чаплыгіна*. Папулярызацыі і развіццю А. садзейнічалі палёты рус. лётчыкаў М.Яфімава, М.Папова, Р.Аляхновіча, Б.Расінскага, С.Утачкіна, А.Васільева, Л.Андрэадзі, Л.Маціевіча і інш. У 1910 Папоў дасягнуў рэкорднага ўзлёту на вышыню 600 м, Аляхновіч у 1911 зрабіў 100-кіламетровы пералёт з рэкордная скорасцю 92 км/гадз. Далейшае развіццё А. атрымала ў гады 1-й сусв. вайны: скорасць самалётаў выраслa да 220 км/гадз, вышыня палётаў — да 7 тыс. м. Рус. лётчык П.М.*Нясцераў* распрацаваў асновы тэхнікі пілатажу і здзейсніў палёт (1913) па пятлі ў верт. плоскасці (гл. *Нясцерава пятля*). У 1916 першым увёў самалёт у штопар, каб прадэманстраваць спосаб выхаду з яго, рус. лётчык К.Арцаулаў. У час вайны выкарыстоўваліся цяжкія самалёты-бамбардзіроўшчыкі тыпу «Ілья Мурамец», якія мелі экіпаж да 8 чал., падымалі да 500 кг бомбаў, былі ўзброены 3—7 кулямётамі (камандзірам такога бамбардзіроўшчыка быў А.М.*Касценчык* з Гродна). Развіццю А. садзейнічалі працы У.П.Вятчынкіна, А.А.*Мікуліна*, Б.С.*Сцечкіна* ў галіне тэорыі рухавікоў. У 1922 разгарнулі дзейнасць авіяц. канструктарскія бюро Грыгаровіча, М.М.*Палікарпава*, А.М.*Тупалева*, А.Дз.*Швяцова* і інш., на самалётах якіх былі атрыманы рэкордныя вынікі. Экіпаж лётчыка М.М.*Громава* на самалёце «Пралетарый» канструкцыі Тупалева ў 1926 ажыццявіў пералёт па Еўропе. На самалёце «Краіна Саветаў» (таго ж канструктара) экіпаж лётчыка С.А.Шастакова ў 1929 пераляцеў з Масквы ў Нью-Йорк праз Сібір і Камчатку. У 1937 экіпажы В.П.*Чкалава* і Громава зрабілі беспасадачныя пералёты ад Масквы да Амерыкі праз Паўн. полюс. З 1932 канструктары працавалі над развіццём знішчальнай А. і стварылі першыя скарасныя знішчальнікі-манапланы, якія дасягалі скорасці 450 км/гадз і вышыні палёту 10 км.

У гады 2-й сусв. вайны значную ролю адыграў самалёт-штурмавік Іл-2 канструкцыі С.У.*Ільюшына*. Знішчальнікі Як-3, Як-9 канструкцыі А.С.*Якаўлева* сталі асн. самалётамі знішчальнай А. Знішчальнікі МіГ-3 (А.І.*Мікаяна* і М.І.*Гурэвіча*), Ла-5, Ла-7, Ла-9 (С.А.Лавачкіна), бамбардзіроўшчыкі Ту-2 (Тупалева), Пе-2, Пе-8 (У.М.Петлякова) не саступалі нямецкім (напр., Ме-109 М), а па асн. паказчыках пераўзыходзілі іх. Пад канец вайны скорасць знішчальнікаў дасягала 700 км/гадз, далёкасць палёту 3 тыс. км, вышыня палёту 13,5 км; скорасць бамбардзіроўшчыкаў — 600 км/гадз, бомбавая нагрузка 5—6 т, вышыня палёту 10,5 км.

Вял. дасягненне А. — выкарыстанне *рэактыўных рухавікоў*. Скорасць гуку была дасягнута на самалёце МіГ-17 з такім рухавіком (1948), звышгукавая скорасць на самалёце МіГ-19. Далейшае развіццё А. было звязана з распрацоўкай магутных і лёгкіх *газатурбінных рухавікоў*. Створаны самалёты верт. ўзлёту і пасадкі, са зменнай у палёце геаметрыяй крыла. П.В.*Сухім* распрацаваны рэактыўныя самалёты Су-9, Су-15 і інш. звышгукавыя знішчальнікі са стрэлападобным і трохвугольным крылом. У 1965 пабудаваны трансп. самалёт Ан-22 («*Антэй*») з найб. у свеце грузаперавозкай.

Да арт. **Авіяцыя.** Самалёты і верталёты пасляваенных гадоў: *10* — МіГ-19; *11* — самалёт вертыкальнага ўзлёту і пасадкі Як-38; *12* — самалёт са зменнай геаметрыяй крыла МіГ-23; *13* — Ту-154; *14* — Іл-76; *15* — верталёт Мі-10К.

Да арт. **Авіяцыя.** Самалёты і верталёты пасляваенных гадоў: *16* — Як-42; *17* — верталёт Ка-26; *18* — F-15 «Ігл» (ЗША); *19* — А-320 (Францыя—Германія).

падымальнасцю (канструкцыя А.К.*Антонава*), у 1977 — самалёт кароткага ўзлёту і пасадкі Ан-72. Да канца 1970-х г. скорасць самалётаў дасягнула 3500 км/гадз, найб. вышыня да 30 км, далёкасць палёту больш за 10 тыс. км. Шырокае развіццё атрымалі верталёты. У 1968 пабудаваны верталёт В-12 (канструкцыі М.Л.*Міля*) рэкордны грузападымальнасці (12 т). Створаны верталёты разнастайнага прызначэння канструкцыі М.І.*Камава*. Скорасць верталётаў дасягнула 355 км/гадз, грузападымальнасць 40 т, далёкасць палёту 3400 км, найб. вышыня 12,5 км. У 1980—90-я г. высокімі лётна-тэхн. паказчыкамі вылучаюцца самалёты МіГ-29, МіГ-31, Су-25, Су-27, Ту-160, Ту-154М, *аэробус* Іл-86, Ан-124 «*Руслан*», Як-42, Як-96, Ту-204; верталёты Мі-26, Мі-10К (верталёт-кран), Ка-32, *вінтакрыл* Ка-22, *аэрасані* Ка-30 і інш. У краінах Зах. Еўропы і Амерыкі ў пасляваен. перыяд на ўзбраенні былі самалёты розных тыпаў і прызначэння, напр. знішчальнікі F-4 «Фантом» і F-104 «Старфайтэр» (ЗША), «Міраж» F.1C і «Міраж-2000» (Францыя), «Тарнада» GR.1 (Вялікабрытанія), знішчальнік-перахопнік F-15 «Ігл», стратэгічныя бамбардзіроўшчыкі В-52 і В-1В, ваенна-транспартны С-5В «Гелаксі» (грузападымальнасць да 118 т), ваенна-камандны пункт Е-4В і самалёт радыёэлектроннай барацьбы EF—111A, сістэмы далёкага радыёлакацыйнага выяўлення АВАКС (на базе «Боінга-707», усе ЗША); эксплуатуюцца пасаж. самалёты: амер. «Боінгі» розных тыпаў, франка-герм. шырокафюзеляжны А-320 (на 331 месца), англа-франц. звышгукавы «*Канкорд*» і інш. У 1944 створана Міжнар. арг-цыя грамадз. А. (ІКАО), якая распрацоўвае рэкамендацыі і стандарты па правах палётаў, эксплуатацыі самалётаў, забеспячэння бяспекі палётаў і інш. Значны ўплыў зрабіла А. на *касманаўтыку*.

На Беларусі авіялініі звязваюць паміж сабой многія гарады, а таксама рэспубліку з замежнымі краінамі (гл. ў арт. *Паветраны транспарт*). Статус міжнар. атрымалі абл. аэрапорты Брэста, Гомеля, Гродна, а Мінск-2 пацвердзіў ІІ катэгорыю ІКАО. Працуюць 5 авіякампаній, у т.л. «Белавія» (эксплуатуюцца самалёты: на магістральных трасах Ту-154Б, Ту-154М, Ту-134А, Ан-26, на мясцовых Ан-24, Як-40, Ан-2; верталёты Ка-26, Мі-2 і інш.), Мінскі авіярамонтны з-д (рамантуе самалёты Ту-134, Як-40, Як-42), авіярамонтныя з-ды ў Баранавічах і пад Оршай, Мінскі дзярж. авіяц. каледж (рыхтуе спецыялістаў для грамадз. і ваен. А.). Сан. А. забяспечана сан. самалётамі і верталётамі. А. спец. прызначэння абслугоўвае сувязь, геал. экспедыцыі, сельскую гаспадарку, пажарную ахову і інш. Гл. таксама *Авіяцыйная прамысловасць*, *Авіяцыйны спорт*.

*Літ.*: Пономарёв А.Н. Авиация настоящего и будущего. М., 1984; Яковлев А.С. Советские самолёты. 4 изд. М., 1982; Андреев И. Боевые самолёты. М., 1981.

**АВІЯ́ЦЫЯ ВАЕ́ННАЯ**, гл. ў арт. *Ваенна-паветраныя сілы*.

**АВУА́РЫ** (ад франц. avoir маёмасць, набытак), 1) актывы (грашовыя сродкі, вэксалі, чэкі, пераводы, акрэдытывы), за кошт якіх робяцца плацяжы і пагашаюцца абавязацельствы іх уладальнікаў; у вузкім сэнсе — ліквідная частка актываў (грашовыя сродкі банка на бягучых рахунках, дэпазітах, каштоўныя паперы, якія лёгка рэалізуюцца). 2) Сродкі банка ў замежнай валюце, золаце, якія знаходзяцца на яго рахунках у замежных банках. Сукупнасць такіх сродкаў, што належаць якой-н. краіне, называюць яе замежнымі А. 3) Уклады прыватных асоб і арг-цый у банках.

Ага.

**АВУЛЯ́ЦЫЯ** (ад лац. ovum яйцо), фізіялагічны працэс выхаду спелых яйцаклетак (аацытаў) у млекакормячых з яечніка ў брушную поласць цела. Пры А. разрываюцца фалікулы (граафавыя пузыркі), яйцаклеткі засмоктваюцца ў яйцавод, дзе праходзяць апошнюю стадыю выспявання і могуць апладніцца. А. адбываецца пад уплывам гармонаў пярэдняй долі гіпофіза. У жанчын А. часцей адбываецца паміж 7-м і 14-м днямі пасля пачатку менструацыі. У жывёл супадае з цечкай. Для А. ў жывёл патрэбны пэўныя ўмовы асяроддзя (даўж. светлавога дня, павышэнне т-ры паветра і вады і г.д.). Спыняецца з надыходам цяжарнасці.

**АВУ́ТА**, рака ў Беларусі, у Глыбоцкім і Міёрскім р-нах Віцебскай вобл., правы прыток Дзісны (бас. Зах. Дзвіны). Даўж. 47 км. Выцякае з воз. Падавута на ПнУ Свянцянскіх град, цячэ па Полацкай нізіне. Даліна шыр. 150—250 м, схілы стромкія. Пойма высокая, шыр. 100—150 м, рэчышча слабазвілістае. Каля 66% гадавога сцёку прыпадае на вясну. Водапрыёмнік меліярац. сістэм.

**АВЯР'Я́НАЎ** Валяр'ян Якаўлевіч (н. 13.8.1919, г. Уладзімір, Расія), бел. вучоны ў галіне радыётэхнікі і радыёэлектронікі. Д-р тэхн. н. (1964), праф. (1968). Ганаровы чл. Міжнар. Акадэміі прыкладной радыёэлектронікі (1994). Засл. рацыяналізатар Беларусі (1967). Скончыў Маскоўскі ін-т інжынераў сувязі (1942). З 1954 у Мінскім вышэйшым інж. радыётэхн. вучылішчы, з 1976 у Бел. ун-це інфарматыкі і радыёэлектронікі. Распрацаваў тэорыю і практычнае выкарыстанне разнесеных радыёлакацыйных станцый і сістэм.

*Тв.*: Разнесенные радиолокационные станции и системы. Мн., 1978.

**АВЯР'Я́НАЎ** Мікалай Піліпавіч (1912, в. Негаўка Буда-Кашалёўскага р-на Гомельскай вобл. — 5.10.1942), герой Вял. Айч. вайны. З чэрв. 1941 на Зах., Данскім франтах. 5.10.1942 у баі каля хутара Хаванскі Серафімовіцкага р-на Сталінградскай вобл. першы падабраўся да дзота праціўніка і закідаў яго гранатамі. Пры блакіраванні другога дзота ў рашаючы момант бою закрыў амбразуру сваім целам.

**АВЯР'Я́НАЎ** Юрый Іванавіч (н. 16.6.1952, р.п. Мікашэвічы Лунінецкага р-на Брэсцкай вобл.), бел. акцёр. Скончыў Вышэйшае тэатр. вучылішча пры Яраслаўскім т-ры імя Волкава (1972). Працуе ў Нац. т-ры імя Я.Купалы. Характарны акцёр. Яму ўласцівы глыбокае адчуванне рэжысёрскай стылістыкі, веданне псіхалогіі сваіх персанажаў, пластычнасць і высокая культура сцэн. мовы. Сярод роляў: Банавантура-Выкрутач («Ідылія» В.Дуніна-Марцінкевіча), Сёмка («Страсці па Аўдзею» У.Бутрамеева), Ак'егет («У ноч зацьмення месяца» М.Карыма), Менахем-Мэндл («Памінальная малітва» Р.Горына паводле Шолам-Алейхема). Аўтар радыёперадач аб музыцы, рэжысёр радыёспектакляў, у т.л. оперы «Агатка» Я.Д.Голанда і М.Радзівіла.

*Б.І.Бур'ян.*

**АГА́** (цюрк. пан, старэйшы брат), тытул малодшых і сярэдніх военачальнікаў у *Асманскай імперыі*. Надаваўся таксама камандзіру *янычараў* і начальнікам некаторых груп прыдворных слуг, часам генеральскі чын (напр., янычарскі А.). У сучаснай Турцыі форма звароту да заможнага землеўладальніка, радзей — складовая частка імя.

**А́ГА** (Bufo marinus), рапуха атр. бясхвостых. Сустракаецца ў Паўд. і Цэнтр. Амерыцы.

Даўж. цела да 25 см. Па баках галавы вял. калявушныя залозы (паратыды). Мае найб. развітыя сярод земнаводных лёгкія. Актыўная ноччу. Самка адкладвае да 35 тыс. ікрынак. Вельмі пражэрлівая: корміцца насякомымі, малюскамі і інш. дробнымі жывёламі. Разводзяць для знішчэння шкоднікаў на плантацыях цукр. трыснягу. Атрутнымі выдзяленнямі скурных залоз А. змазваюць наканечнікі стрэл.

**АГАБАБЯ́Н** Рыгор Гарэгінавіч (25.6.1911, Гюмры, Арменія —

18.3.1977), армянскі архітэктар. Засл. дз. маст. Арменіі (1961). У 1950—59 гал. архітэктар Ерэвана. У творчасці абапіраўся на вопыт арм. класічнай архітэктуры, выкарыстоўваў сучасныя канструкцыі. Асн. работы: цэнтр. крыты рынак, Вял. Разданскі мост і аўтавакзал у Ерэване.

**АГАБЕ́КАЎ** Уладзімір Янокавіч (н. 19.1.1940, г. Грозны, Чэчня), бел. хімік. Д-р хім. н. (1981), праф. (1987). Скончыў Грозненскі нафтавы ін-т (1963). З 1963 у Ін-це фізіка-арган. хіміі АН Беларусі. Навук. даследаванні па фізікахіміі свабоднарадыкальных працэсаў у тонкіх плёнках арган. і высокамалекулярных злучэнняў, стварэнні рэзістыўных і палярызацыйных матэрыялаў для электроннай прам-сці.

*Тв.:* Механизм жидкофазного окисления кислородосодержащих соединений. Мн., 1975 (разам з Я.Ц.Дзянісавым, М.І.Міцкевічам).

**АГА́ВА** (Agave), род шматгадовых раслін сям. агававых. Радзіма — Цэнтр. Амерыка. Больш за 300 відаў. У Еўропу завезена пасля адкрыцця Амерыкі. Некаторыя віды культывуюцца ў адкрытым грунце ў Крыме і на Каўказе. На Беларусі ў пакоях і аранжарэях як дэкар. вырошчваецца А. нітканосная (A. filifera), А. сціснутая (A. stricta), А. амерыканская (A. americana) і інш.

Сцябло ўкарочанае, з разеткай буйнога мясістага калючага лісця. Цвітуць раз у жыцці на 6—15-м годзе, утвараючы кветанос выш. да 12 м з шматкветнай (да 17 тыс.) мяцёлкай. Потым расліны адміраюць, ад карэнішча адрастаюць парасткі. Каштоўныя: з лісця робяць грубую тканіну, паперу, з соку — напоі, з каранёў — лекі.

**АГАВЕ́**, А г а ў э (Ogowe, Ogooué), рака ў Цэнтральнай Афрыцы (Конга, Габон). Даўж. каля 1200 км, пл. вадазбору 216 тыс. км$^2$. Пачынаецца на Паўд.-Гвінейскім узв., упадае ў Атлантычны ак. Парожыстая, у вярхоўі ўтварае вадаспад Пубра. Сярэдні расход вады каля 5 тыс. м$^3$/с. Суднаходная ў ніжнім цячэнні ад вусця да г. Нджоле.

**АГАДЖАНЯ́Н** Сцяпан Меліксетавіч (28.12.1863, г. Шуша, Нагорны Карабах — 13.12.1940), жывапісец-партрэтыст. Нар. мастак Арменіі (1938). Вучыўся ў маст. студыі ў Марселі (1886—90) і ў акадэміі Жуліяна ў Парыжы (1897—1900). Выкладаў у Ерэванскім маст. вучылішчы (1922—40). Рэаліст. партрэты А. адметныя глыбокім псіхалагізмам, стрыманым каларытам (партрэты бацькі і маці, аўтапартрэт, «Дзядзька Седрак», «Васіл», «Беспрытульнік» і інш.).

**АГАДЖАРЫ́**, газаканденсатна-нафтавае радовішча ў Іране, за 130 км ад г. Абадан, адно з буйнейшых у свеце. У межах *Персідскага заліва нафтагазаноснага басейна*. Адкрыта ў 1938, распрацоўваецца з 1945. Пачатковыя прамысл. запасы нафты 1283 млн. т, газу 263 млрд. м$^3$. Нафтаносны паверх на глыб. 1240 м, газанафтавы — 1400 м. Шчыльн. нафты 850 кг/м$^3$. Дзесяткі фантануючых свідравін. Нафтаправоды ў порт Бендэр-Махшэхр і Абадан.

**АГАДЫ́Р**, горад на ПдЗ Марока. Адм. ц. правінцыі Агадыр. Засн. ў 16 ст. 779 тыс. ж. (з прыгарадамі; 1990). Порт на ўзбярэжжы Атлантычнага ак. Міжнар. аэрапорт. Буйны рыбапрамысл. цэнтр. Вываз рыбных кансерваў, цытрусаў, ранняй агародніны, рудаў каляровых металаў. Цэм. з-д. Цэнтр турызму і адпачынку. Моцна пацярпеў ад землетрасення ў 1960.

**АГА́ЙО** (Ohio), рака ў ЗША, левы прыток Місісіпі. Даўж. 1580 км, пл. вадазбору 528 тыс. км$^2$. Пачынаецца з Апалачскіх гор, перасякае Апалачскае плато і Цэнтр. раўніну. Гал. прытокі: Кентукі, Камберленд, Тэнесі. Сярэднегадавы расход вады каля 8 тыс. м$^3$/с. Шлюзаваная. Суднаходная (парогі каля г. Луісвіл абведзены каналамі). У бас. буйныя ГЭС. На А. гарады Пітсбург, Цынцынаты, Луісвіл.

Агава амерыканская.

**АГА́ЙО** (Ohio), штат на ПнУ ЗША, паміж воз. Эры і р. Агайо. Пл. 106,1 тыс. км$^2$. Нас. 11 091 тыс. чал., гарадскога каля 80% (1993). Адм. цэнтр — г. Калумбус. Найб. гарады Кліўленд, Цынцынаты, Акран, Кантан, Таліда, Дэйтан, Янгстаўн. На У — невысокае Апалачскае плато, парэзанае рачнымі далінамі. На З — узгорыстыя Цэнтральныя раўніны з урадлівымі глебамі. Сярэднія т-ры студз. ад 0 да -3 °С, ліп. 23—25 °С; ападкаў 800—1000 мм за год. На плато месцамі захаваліся шыракалістыя лясы. Буйны індустр. штат, займае 3-е месца ў краіне па кошце вырабленай прадукцыі. Вядучыя галіны прам-сці: машынабудаванне, электратэхніка ў спалучэнні з аўтамабіле- і с.-г. машынабудаваннем, чорная металургія, хім., гумавая, харч., папяровая, керамічная; здабыча каменнага вугалю, нафты, прыроднага газу, солі і інш. Малочная і мясная жывёлагадоўля. Вырошчваюць кукурузу, авёс, сеяныя травы, пшаніцу, агародніну, садавіну, вінаград. Транспарт чыг. і водны (р. Агайо і воз. Эры). Гал. парты Кліўленд, Цынцынаты, Таліда.



Да арт. **Агаленне горных парод.** Рознае геалагічнае агаленне мелу ў Ваўкавыскім раёне Гродзенскай вобл.

**АГАЛЕ́ННЕ ГО́РНЫХ ПАРО́Д**, выхад карэнных горных парод на зямную паверхню. Бывае натуральнага паходжання (па берагах рэк, схілах яроў, хрыбтоў) і штучнага (у кар'ерах, шахтах, шурфах, канавах). Маюць навуковае (у геалогіі) і практычнае (пры пошуках карысных выкапняў) значэнне. На Беларусі некаторыя агаленні абвешчаны *геалагічнымі помнікамі прыроды*, на асобных з іх наладжана вытв-сць буд. матэрыялаў (напр., Мікашэвіцкае, Глушкавіцкае радовішчы буд. каменю).

**АГАМЕ́МНАН** (грэч. Agamemnōn), у старажытнагрэчаскай міфалогіі цар *Мікен* (ці Аргаса), правадыр Тахейскага войска ў час *Траянскай вайны*. Сварка А. з *Ахілам* пад Трояй — зыходны пункт развіцця сюжэта ў гамераўскай «Іліядзе». Пасля ўзяцця Троі А. вярнуўся дамоў, дзе быў забіты жонкай Клітэмнестрай і яе каханкам Эгісфам. Забойству А. прысвечаны трагедыі Эсхіла і Сенекі.

Залатая пахавальная маска, т. зв. маска Агамемнана, з грабніцы. 2-я пал. 16 ст. да н.э.

**АГАМІРЗЯ́Н** Рубен Сяргеевіч (20.12.1911, Тбілісі — 26.10.1991), рэжысёр. Нар. арт. Расіі (1974), нар. арт. СССР (1983). Засл. дз. маст. Расіі (1969) і Грузіі (1972). Праф. (1975). Скончыў Ленінградскі тэатр. ін-т імя А.М.Астроўскага (1953). З 1966 гал. рэжысёр Ленінградскага драм. т-ра імя В.Ф.Камісаржэўскай. Сярод пастановак драм. трылогія «Смерць Іаана Грознага», «Цар Фёдар Іаанавіч», «Цар Барыс» А.К.Талстога (Дзярж. прэмія СССР 1984). У Бел. т-ры імя Я.Купалы паставіў спектаклі «Я, бабуля, Іліко і Іларыён» Н.Думбадзе і Г.Лордкіпанідзе (1965) і «...Забыць Герастрата!» Р.Горына (1974), якія вылучаліся цікавай рэжысёрскай задумай, яркай формай і выдатнымі акцёрскімі работамі.

**АГАМІ́ЧНАЕ ПІСЬМО́** (стараж.-ірл. ogam, ogum), літарнае пісьмо *кельтаў* і піктаў на Брытанскіх а-вах. Вядома па надпісах з 4 ст. Аснова А.п. — лінія, на якую наносіліся кропкі і штрыхі. Літара складалася з сукупнасці аднолькавых (ад 1 да 5) штрыхоў (зычны гук) ці кропак (галосны гук). Паходжанне невядома. Выцеснена лацінкай, але як тайнапіс у Ірландыі захавалася да 17 ст.

**АГА́МЫ** (Agamidae), сямейства яшчарак атр. лускаватых. 35 родаў, больш за 300 відаў. Найб. вядомыя круглагалоўкі (Phrynosephalus), драконы (Draco), яшчаркі плашчаносныя (chlamydosaurus), калоты (Calotes). Водзяцца пераважна ў стэпавых і пустынных зонах Афрыкі (акрамя Мадагаскара), Паўд.-Усх. Еўропы, Азіі, Аўстраліі і Новай Гвінеі. Жывуць на зямлі, скалах або дрэвах.

Даўж. да 45 см. Галава і шыя ўкрытыя дробнымі рагавымі шчыткамі, у некат. уздоўж спіны грэбень. Хвост звычайна доўгі, няломкі. Могуць мяняць афарбоўку цела. Кормяцца насякомымі, зрэдку раслінамі. Кладуць яйцы, некат. жывародныя.

Агамы: *1* — руінная; *2* — камянёвая.

Агар.

**АГАНБЕГЯ́Н** Абел Гезевіч (н. 8.10.1932, Тбілісі), вучоны-эканаміст. Акад. АН СССР (1982, чл.-кар. 1964), акад. Рас. АН (1991). Скончыў Маскоўскі эканам. ін-т (1955). У 1961—80 у ін-це эканомікі і арганізацыі прамысл. вытв-сці Сібірскага аддз. АН СССР (з 1967 дырэктар). З 1987—89 акад.-сакратар Аддз. эканомікі АН СССР, з 1989 рэктар Акадэміі нар. гаспадаркі пры СМ Расіі. Асн. кірунак навук. дзейнасці — праблемы кіравання, прадукцыйнасці працы, заработнай платы і ўзроўню жыцця.

*Тв.*: Вопросы теории монопольной цены. На примере США. М., 1961; Управление и эффективность. М., 1981.

**АГАНЕСЯ́Н** Эдгар Сяргеевіч (н. 14.1.1930, Ерэван), армянскі кампазітар. Нар. арт. СССР (1986). Вучань Р.Егіязарана і А.Хачатурана. У 1962—68 дырэктар Арм. т-ра оперы і балета. З 1986 праф. і рэктар Ерэванскай кансерваторыі. Дзярж. прэмія Арменіі 1967, Дзярж. прэмія СССР 1979.

*Тв.*: Опера «Падарожжа ў Арзрум» паводле А.С.Пушкіна (1987), балеты «Мармар» (1957), «Блакітны накцюрн» (1964), «Вечны ідал» (1966), «Антуні» (1969), опера-балет «Давід Сасунскі» (1976); вак.-сімф. творы; 3 сімфоніі, «Канцэрт-Барока» для сімф. арк. (1983); фп. квінтэт, струнныя квартэты; санаты; хар. цыклы; апрацоўкі арм. нар. песень, танцаў і інш.

**АГАНІ́СТЫКІ** (ад грэч. agōnistikos здольныя да барацьбы), цыркумцэліёны, дэмакратычная хрысц. секта калонаў і рабоў у рым. Афрыцы 4—5 ст., левае крыло *данатыстаў*. Пратэставалі супраць сац. няроўнасці, паднявольнай працы, асуджалі афіц. царкву, прапаведавалі аскетызм, пакутніцтва. Узначальвалі паўстанні калонаў і рабоў у Нумідыі каля 340 і ў пач. 5 ст.

**АГА́НЬЯ** (Agaña), галоўны горад і порт на в-ве Гуам (уладанне ЗША), у зах. частцы Ціхага ак. 1,1 тыс. ж. (1990). Паблізу аэрапорт і ваен. базы ЗША.

**АГА́Р**, чырвоная качка (Casarca ferruginea), птушка сям. качыных атр. гусепадобных. Пашырана ў Паўд. Еўропе, Паўн. Афрыцы і Азіі. На Беларусі рэдкая залётная птушка.

Даўж. цела каля 60 см, маса 1—1,6 кг. Самкі меншыя за самцоў. Жыве парамі. Гнёзды ў глыбокіх норах стэпавых звяркоў, нішах абрываў, пакінутых будынках. Самка нясе 8—12 яец, наседжвае іх. Птушаняты растуць і ў няволі. Кормяцца раслінамі і воднымі беспазваночнымі.

**АГАРА́** (грэч. agora), у стараж. грэкаў назва нар. сходу і месца, дзе ён адбываўся. А. займала цэнтр. месца т. зв. ніжняга горада, які размяшчаўся пад узгоркам *акропаля*. Звычайна А. — цэнтр. гандл. плошча горада (у перыяд архаікі складалася стыхійна; у эпоху класікі і элінізму мела рэгулярную планіроўку), на якой знаходзіліся храмы, дзярж. ўстановы, майстэрні і крамы.

**АГА́Р-АГА́Р**, арганічнае рэчыва (поліцукрыдны прэпарат), якое вырабляецца з чырвоных і бурых марскіх водарасцяў. Складаецца з агарозы і агарапекціну, растварэцца ў вадзе пры 80—86 °С, застывае пры 40 °С, утварэючы шчыльную студзіну. Выкарыстоўваецца ў біялогіі як пажыўнае асяроддзе для вырошчвання клетак і мікраарганізмаў, а

таксама ў харч. прам-сці, кулінарыі і медыцыне пры лячэбным харчаванні.

**АГАРАДЖА́ЛЬНЫЯ ЗБУДАВА́ННІ**, гідратэхнічныя збудаванні для засцярогі партовай акваторыі ад хваляў, плыняў, наносаў і лёду. Бываюць унутраныя (прадухіляюць утварэнне хваляў у акваторыі порта) і знешнія. Да А.з. адносяцца *молы* і *хваляломы* (на морах, вадасховішчах, азёрах), лёдаахоўныя *дамбы* і *ледарэзы* (на рэках). Паміж берагам і А.з. або паміж суседнімі А.з. пакідаюць праход для суднаў. З боку мора (вадаёма) кожнае А.з. мае пашыраную частку абцякальнай формы, якая будуецца звычайна на глыбіні не меншай за падводную вышыню разліковай хвалі. Пры праектаванні А.з. улічваюць канфігурацыю берага і дна, напрамак вятроў, плыняў і наносаў.

**АГАРАДЖА́ЛЬНЫЯ КАНСТРУ́КЦЫІ**, будаўнічыя канструкцыі, якія складаюць вонкавую частку будынкаў ці падзяляюць іх на асобныя памяшканні. Засцерагаюць будынкі ад вільгаці, ветру, шуму, т-ры. Часта адначасова выконваюць функцыі *нясучых канструкцый*. Адрозніваюць вертыкальныя (сцены, перагародкі) і гарызантальныя (перакрыцці, пакрыцці, дахі).

Паводле канструкцыі А.к. бываюць: маналітныя, зборныя і зборна-маналітныя; простыя (аднаслойныя) і комплексныя (мнагаслойныя); з дробных (пліт, шчытоў, насцілаў) і буйнапамерных (буйнаблочныя, буйнапанэльныя і каркасна-панэльныя) элементаў. Робяць з бетону, жалезабетону, армацэменту, сталі, алюмініевых сплаваў, цэглы, каменю, драўніны, шкла, пластмасаў, паветранепранікальных тканін і плёнак і інш. Асн. патрабаванні да А.к. — мех. трываласць, жорсткасць, вільгаце-, вогне- і марозаўстойлівасць, даўгавечнасць, арх. выразнасць. Удасканаленне А.к. ідзе ў бок змяншэння іх масы і кошту, паляпшэння цеплафіз. уласцівасцяў і канструкцыйных вырашэнняў, павышэння ступені заводскай гатоўнасці.

**АГА́РКАЎ** Мікалай Васілевіч (30.10.1917, с. Молакава Цвярской вобл. — 25.1.1994), Маршал Сав. Саюза (1977), Герой Сав. Саюза (1977). Удзельнік Вял. Айч. вайны. У 1961—68 нач. штаба і камандуючы войскамі паветр. абароны. З 1968 1-ы нам. нач. Генштаба, з 1974 нам. міністра абароны СССР. У 1977—84 нач. Генштаба Узбр. Сіл СССР — 1-ы нам. міністра абароны СССР. З 1984 на кіруючых пасадах ва Узбр. Сілах СССР.

**АГАРО́ДЖВАННІ**, спецыфічная форма ліквідацыі абшчынных зямель і распарадкаў у еўрап. краінах у 13 — пач. 19 ст. Назва ад распачатага ў Англіі працэсу захопу і агароджвання лендлордамі абшчынных пашаў для гадоўлі на іх авечак. У 15—16 ст. развіццё тэкст. прам-сці і вял. попыт на воўну зрабілі авечкагадоўлю прыбытковай справай. Таму буйныя землеўладальнікі пачалі інтэнсіўна зганяць сялян з ворных зямель і ператвараць іх у пашу. У 16—18 ст. А. былі пашыраны ў Нідэрландах, Францыі, Германіі. У 18 ст. англ. парламент узаконіў А. і яны працягваліся да пач. 19 ст. Супраціўленне і паўстанні збяднелых сялян супраць А. (адно з буйнейшых у 1549 пад кіраўніцтвам Р.Кета) душыліся ўладамі. Адным з вынікаў А. быў адток сялян у прамысловасць.

*Літ.*: Митрофанов В.П. Вопрос об огораживаниях в английском парламенте (конец XVI — начало XVII в.) // Проблемы истории Западной Европы развитого и позднего феодализма. Иваново, 1986.

**АГАРО́ДНІКІ**, сяляне ў ВКЛ, якія пасяляліся на невял. дзялянках зямлі, за што абавязваліся выконваць пэўныя павіннасці. А. давалі па 3 маргі (1 морг — 0,71 га) зямлі і сялілі вёскамі па 10—20 двароў паблізу фальваркаў. За надзелы А. адпрацоўвалі на землеўладальніка 1 дзень у тыдзень без каня, а іх жонкі — 6 дзён за лета. У час *валочнай памеры* ў катэгорыю А. пераводзілі *чэлядзь*. У 18 — 1-й пал. 19 ст. А. называлі сялян, якія мелі толькі хату і агарод.

**АГАРО́ДНІКІ**, вёска ў Беларусі, у Бярозаўскім с/с Калінкавіцкага р-на Гомельскай вобл. Цэнтр калгаса імя Чапаева. За 35 км на ПдУ ад горада і чыг. ст. Калінкавічы, 157 км ад Гомеля. 1855 ж., 860 двароў (1995). Базавая школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі.

**АГАРО́ДНІКІ**, вёска ў Беларусі, у Камянецкім р-не Брэсцкай вобл., на р. Пульва. Цэнтр сельсавета і калгаса «Дружба». За 40 км на З ад г. Камянец, 45 км ад Брэста, 6 км ад чыг. ст. Вярба. 405 ж., 158 двароў (1994). Базавая школа, б-ка, клуб, дзіцячы сад, аддз. сувязі. Селішча паморскай культуры (4—2 ст. да н.э.).



**Агара** ў Асосе (эліністычны перыяд). Рэканструкцыя.

**АГАРО́ДНІКІ**, вёска ў Беларусі, у Сакалоўскім с/с Бярозаўскага р-на Брэсцкай вобл. Цэнтр калгаса «Журавінка». За 10 км на У ад Бярозы, 120 км ад Брэста, 13 км ад чыг. ст. Бяроза-Картузская. 428 ж., 186 двароў (1995). Сярэдняя школа.

**АГАРОДНІНАСУШЫ́ЛКА**, машына для правяльвання і сушкі агародніны, садавіны, ягад, грыбоў, траў, а таксама насення агародніннных і інш. культур. Найб. пашыраны А. камернага і стужкавага тыпаў. Крыніца цяпла — электранагравальнікі, паравыя каларыферы, паветранагравальнікі. Выкарыстоўваюцца пераважна стужкавыя А., у якіх нарэзаная агародніна на рухомай стужцы з дробнаячэйкавай сеткі высушваецца падагрэтым паветрам. Прадукцыйнасць прамысл. А. да 0,2 т/гадз. Існуюць канструкцыі А. бытавых.

**Схема агароднінасушылкі:** *1* — загрузка матэрыялу; *2* — сушыльная стужка; *3* — награвальныя батарэі; *4* — выпускная труба; *5* — зборны дыфузар; *6* — прывадны барабан; *7* — нацяжны барабан; *8* — падача свежага паветра; *9* — выпуск матэрыялу; *10* — перапускны латак.

**АГАРО́ДНІННЫЯ КУЛЬТУ́РЫ**, расліны, якія вырошчваюць для атрымання агародніны (сакаўных пладоў, лісця, цыбулін, караняплодаў). У сусв. асартыменце А.к. каля 160 відаў, сярод якіх кораненаклубняплодныя расліны, шырока вядомыя ў краінах трапічнага і субтрапічнага клімату, — касава (маніёк ядомы), тара, ямс і інш. На Беларусі

М.П.Агароў.

вырошчваюць больш за 40 відаў асн. А.к. амаль з 13 сямействаў.

Паводле прадукцыйных органаў адрозніваюць А.к. пладовыя (памідоры, агурок, кабачок, патысон, гарбуз, баклажан, кавун, дыня, кукуруза), ліставыя (капуста, салата, шпінат, шчаўе, рэвень), цыбулевыя (цыбуля, часнок), бабовыя (гарох, фасоля, боб), караняплоды (морква, бурак, сельдэрэй, пятрушка, радыска, рэдзька, бручка, рэпа). У асобныя групы вылучаюць бульбу і востраплыпраўныя расліны (аніс, каляндра, крэс-салата, кмен, мята, маяран, агурочнік, эстрагон, хрэн і інш.; пра кожную А.к. гл. асобны арт.). Асн. крыніца вітамінаў, вугляводаў, мінер. соляў, арган. к-т, мікраэлементаў, гліказідаў, фітанцыдаў, эфірнага алею, а таксама клятчаткі і пекцінавых рэчываў. Вырошчваюцца ў адкрытым (на працягу вегетац. перыяду з вясны да восені) і ахаваным (увесь год) грунце.

*Літ.*: Гусев А.М. Целебные овощные растения. М., 1991; Матвеев В.П., Рубцов М.И. Овощеводство. 3 изд. М., 1985; Шуин К.А. 70 видов овощей на огороде. Мн., 1978.

**АГАРО́ДНІЦТВА**, 1) галіна *раслінаводства* па вырошчванні *агародніных культур*. Адрозніваюць А. адкрытага — на палях, агародах (дае асн. збор прадукцыі і насенне) і ахоўнага — у цяпліцах, парніках і пад больш простымі ўкрыццямі (ліквідуе сезоннасць у забеспячэнні насельніцтва свежай агародніной) грунту. У многіх краінах свету з'яўляецца прыярытэтнай галіной сельскай гаспадаркі.

На прамысл. аснове вядзецца ў ЗША, Нідэрландах, Францыі, Іспаніі, Італіі, Германіі, Японіі і інш. Характарызуецца шырокім асартыментам культур, выкарыстаннем дасягненняў навук.-тэхн. прагрэсу (селекцыя, стварэнне гетэрозісных гібрыдаў, гідрапонная тэхналогія з малааб'ёмнымі субстратамі і пажыўнымі растворамі і інш.). У Зах. Еўропе і ЗША па індустр. тэхналогіях культывуецца больш за 40 агародніных культур, у Японіі — больш за 160. З краін СНД адносным развіццём А. вылучаюцца Малдова, Украіна, Азербайджан, а таксама Краснадарскі край, Растоўская, Маскоўская і некаторыя інш. вобласці Расіі. На Беларусі ў канцы 19 — пач. 20 ст. таварнае А. пашырылася ў Пінскім, Рэчыцкім, Лепельскім, Дзвінскім, Чэрыкаўскім, Мсціслаўскім і інш. паветах, а таксама каля Гомеля і Магілёва. За межы Беларусі вывозілі пераважна капусту. У 1993 у рэспубліцы вырашчана 1048 тыс. т агародніны, 45 тыс. т атрымана ў закрытым грунце [каля 400 га зімовых і вясенніх (плёначных) цяпліц]. А. мае больш высокую канцэнтрацыю ў прыгарадных зонах Мінска, Гомеля, Магілёва, Брэста і інш. На Беларусі пад агародніннымі культурамі 73,6 тыс. га (1994).

2) Навука пра біялогію агародніных культур і спосабы іх вырошчвання. У 19 ст. на сусв. выстаўках поспех мелі сарты рус. вучонага Я.А.Грачова. Найб. падрабязнае апісанне агародніных раслін зроблена франц. вучоным Д.Буа (1927). Значная роля ў развіцці А. належыць працам Р.І.Шрэдэра, М.В.Рытава, У.І.Эдэльштэйна, М.І.Вавілава і інш. На Беларусі даследаванні пачаліся ў 19 ст. ў Горы-Горацкім земляробчым ін-це, значна пашырыліся пасля стварэння Бел. плодаагародніннай доследнай станцыі (1931) і арганізацыі Бел. НДІ пладаводства, агародніцтва і бульбы (1958), вядуцца ў Бел. НДІ агародніцтва, Гродзенскім с.-г. ін-це, Бел. с.-г. акадэміі, на абл. с.-г. доследных станцыях.

Выведзена каля 100 сартоў і гібрыдаў памідораў, белакачаннай капусты, сталовых буракоў, гароху, агуркоў, цыбулі рэпчатай і інш. агародніных раслін. Распрацавана агратэхніка вырошчвання агародніны ва ўмовах Беларусі (Л.А.Скрыпнічэнка, П.С.Шастапал, Б.А.Юргенс, І.І.Цішкевіч, У.П.Пярэднеў, А.А.Аутка, Т.С.Якубіцкая, А.А.Казіміраў, П.С.Жукава, М.Ф.Сцяпура, К.А.Шуін, Ю.М.Забара, П.Я.Півень), распрацаваны сістэмы ўгнаенняў для асн. культур, схемы элітнага насенняводства.

Праблемы сучаснага А.: распрацоўка перспектыўных тэхналогій вытв-сці агародніны; вывядзенне сартоў інтэнсіўнага тыпу, устойлівых да хвароб і шкоднікаў; распрацоўка сістэм угнаення агародніных культур у севазвароце на розных тыпах глебаў і новых аграпрыёмаў.

*Літ.*: Интенсивное плодоовощеводство. Горки, 1992; Шуин К.А. Овощеводство. Мн., 1987.

**АГАРО́ДНІЦТВА БЕЛАРУ́СКІ НАВУКО́ВА-ДАСЛЕ́ДЧЫ ІНСТЫТУ́Т** Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання і Акадэміі аграрных навук Рэспублікі Беларусь. Засн. ў 1990 у Мінску на базе Бел. НДІ бульбаводства і плодаагародніцтва. Асн. кірункі даследаванняў: стварэнне высокапрадукцыйных сартоў і гібрыдаў агародніннных культур і тэхналогій вытв-сці іх насення; распрацоўка энергазберагальных і прыродаахоўных тэхналогій і сістэм вядзення агародніцтва ў адкрытым і ахаваным грунце і інш. Ін-там створана больш'за 100 сартоў і гібрыдаў агародніннных культур. *А.А.Аутка.*

**АГАРО́Ў** Мікалай Платонавіч (6.12.1813, С.-Пецярбург — 12.6.1877), рус. паэт, публіцыст, рэв. дзеяч. У час вучобы ў Маскоўскім ун-це (1832—33) удзельнічаў у паліт. гуртках, захапляўся франц. утапічным сацыялізмам. З 1856 у эміграцыі (Лондан, Жэнева). На фарміраванне светапогляду паўплывалі *дзекабрысты* і А.*Герцэн*, з якім выдаваў альманах «*Полярная звезда*» і газ. «*Колокол*». Адзін з заснавальнікаў рэв. арг-цыі «Зямля і воля» (1860-я г.). У лірычных творах заклікаў да барацьбы з самадзяржаўем, абгрунтоўваў ідэю грамадскага прызначэння паэзіі, прапагандаваў прынцыпы рэалізму (цыклы «Маналогі», «Успаміны дзяцінства», вершы «Памяці Рылеева», «Свабода», паэмы «Гумар», «Вёска», «Зімовы шлях», «Мацей Радаеў» і інш.). Аўтар аповесцяў, публіцыстычных і літ.-крыт. артыкулаў.

*Тв.*: Стихотворения и поэмы. М., 1980; Избранное. М., 1984.

*Літ.*: Конкин С. Огарев. 2 изд. Саранск, 1982.

**АГАРЫКА́ЛЬНЫЯ**, пласціністыя (Agaricales), парадак вышэйшых *базідыяльных грыбоў* з групы гіменаміцэтаў. Аб'ядноўвае 12 сям., каля 8 тыс. відаў, пашыраных ва ўсіх кліматычных паясах абодвух паўшар'яў. На Беларусі 110 родаў уключаюць 1,5 тыс. відаў. Найбольшыя сям.: агарыкальныя, ці шампіньёнавыя (Agaricaceae), і балетавыя, якія вылучаюць у самаст. парадак (Boletales); сярод найб. вядомых сям.: аманітавыя, ці мухаморавыя (Amanitaceae), бальбітыевыя (Bolbitiaceae), гіграфоравыя (Hygrophoraceae), гнаевіковыя (Coprinaceae), макрухавыя (Gomphidiaceae), павуцінніквыя (Cortinariaceae), радоўкавыя (Tricholomataceae), ружовапласціннікавыя (Rhodophyllaceae), свінухавыя (Paxillaceae), страфарыевыя (Strophariaceae), сыраежкавыя (Russulaceae). Пладовыя целы аднагадовыя, звычайна мяккамясістыя, радзей пругкія, маюць шапку і ножку (звычайна цэнтральную). Гіменафор пласціністы або трубчасты, у многіх спачатку прыкрыты прыватным пакрывалам (плеўка з рыхлага спляцення гіфаў), якое пазней разрываецца і застаецца ў выглядзе кольца на ножцы (напр., віды з роду маслякоў); у іншых развіваецца таксама і агульнае пакрывала (спачатку на ўсім пладовым целе, потым застаецца накшталт кубачка-вольвы на ножцы і як шматкі на шапцы, напр., шампіньён ядомы, грыбы з роду вальварыела). Пласцінкі могуць быць свабодныя, прымацаваныя да ножкі краем або зубцом, сыходныя па ножцы і інш. Ножка рознага колеру, кансістэнцыі і формы (цыліндрычная, патоўшчаная, звужаная, гладкая слізістая, укрытая лускавінкамі або валакністая, шчыльная, пустая і інш.), часам бакавая ці яе зусім няма (шапка сядзячая). Споры аднаклетачныя, іх памеры, форма, колер зменлівыя. Большасць А. — сапратрофы на глебе, подсціле, драўніне, мікарызаўтваральнікі (забяспечваюць водна-салявое жыўленне дрэў), радзей — паразіты на жывых дрэвах, пладовых целах інш. А. Многія (амаль 200 відаў) — каштоўныя ядомыя грыбы: *баравік, падасінавік, падбярозавік, маслякі,*

*зялёнка, падзялёнка, шампіньён, рыжык*, вешанка звычайная, грузд, сыраежкі і інш.; ёсць ядавітыя: *мухаморы* чырвоны, жоўта-зялёны, парфіравы, пантэрны, *бледная паганка* і інш. віды, апенька несапраўдная серна-жоўтая, пабеленая і белаватая гаварушкі, валаконніцы земляная, надарваная і Келе, страфарыя Горнемана, лускаўніцы і інш.

*Літ.:* Жизнь растений. М., 1976. Т. 2. С. 260—271; Сержанина Г.И. Шляпочные грибы Белоруссии. Мн., 1984. С. 233—351.

**АГАРЭ́ВІЧЫ**, вёска ў Беларусі, у Ганцавіцкім р-не Брэсцкай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Кірава. За 7 км на У ад Ганцавіч, 250 км ад Брэста. 1528 ж., 573 двары (1994). 3 цэхі (па вытв-сці безалкагольных напіткаў, каўбасны і швейны). Сярэдняя школа, Дом культуры, аддз. сувязі, камбінат быт. абслугоўвання. Помнік архітэктуры — сядзіба 19 ст.

**АГА́СТА** (Augusta), горад на ПдУ ЗША, у штаце Джорджыя, порт на р. Савана. Засн. ў 1735. 397 тыс. ж. (з прыгарадамі; 1990), частка прыгарадаў у штаце Паўд. Караліна. Вузел чыгунак і аўтадарог. Хімічная (у т.л. вытв-сць мінер. угнаенняў, лякарстваў), сталеліцейная, цэлюлозна-папяровая, тэкст., шкларобная, харч. прам-сць. Вытв-сць кантрольна-вымяральных прылад і мед. інструментаў, вогнетрывалай цэглы. У прыгараднай зоне атамны камбінат «Савана-Рывер».

**АГАСФЕ́Р**, гл. *Вечны жыд*.

**АГА́Т** (грэч. achatēs), мінерал, разнавіднасць *халцэдону* з паласатай ці плямістай тэкстурай або дэкаратыўнымі ўключэннямі. Адрозніваюць: агаты (блакітнавата-шэрыя і белыя), агатавы онікс (белыя і чорныя слаі), карнеалонікс (чырвоныя і белыя), сардонікс (чырвона-бурыя і белыя) і інш. Характар афарбоўкі — вясёлкавы. Бляск васковы да матавага. Цв. 6—6,5. Шчыльн. каля 2,6 г/см$^3$. Выкарыстоўваецца ў прыладабудаванні, як паўкаштоўны камень.

**«АГА́Т»**, навукова-вытворчае аб'яднанне на Беларусі. Створана ў 1986. Уключае НДІ сродкаў аўтаматызацыі (галаўное прадпрыемства), НДІ «Агат», электрамех. з-д (усе ў Мінску), доследны з-д «Нёман» (г. Ліда). Спецыялізавана на выпуску аўтаматызаваных інфарм.-выліч. і кіравальных сістэм і праграмна-тэхн. сродкаў для розных сфер дзейнасці (транспарт, энергетыка, экалогія, ахова здароўя, адукацыя, адм. кіраванне, банкаўская і праваахоўная справа і інш.). Вырабляе таксама тавары нар. ўжытку, мед. тэхніку, тэхнал. прадукцыю для аграпрома.

**АГАТАНГЕЛО́С**, армянскі гісторык 5 ст. Аўтар «Гісторыі Арменіі» (збераглася ў рэдакцыі 7—8 ст.; апубл. ў 1709, навукова выверана тэкст — у 1909), якая асвятляе падзеі 226—30, эпоху прыняцця армянамі хрысціянства, дае звесткі пра грамадскі і дзярж. лад Арменіі, гіст. асоб, барацьбу хрысціянства і язычніцтва, спалучаныя з нар. легендамі і паданнямі. Перакладзена на мовы многіх народаў свету; мела некалькі версій. *А.Казінян.*

**АГА́ТКІ** (Antennaria), род шматгадовых травяністых або паўкусцікавых раслін сям. складанакветных. Больш за 100 відаў, пашыраных па ўсім зямным шары, асабліва ў арктычных і высакагорных раёнах (акрамя Афрыкі). На Беларусі трапляюцца А. двухдомныя (A. dioica), нар. назвы: сухотнік палявы, кацалапкі, сухапут, аўдулькі, коткі, пух. Растуць у хваёвых лясах, на сухіх лугах і схілах.

Расліны выш. 5—30 см, двухдомныя, густа апушаныя. Кветкі белыя (двухполыя) або ружовыя (песцікавыя). Суквецце — кошык шыр. 5—6 мм. Плод — сямянка з чубком. Выкарыстоўваецца ў лек. і дэкар. мэтах.

**АГАФО́КЛ** (каля 361—289 да н.э.), тыран у *Сіракузах* (з 316) і Сіцыліі. Вызначыўся на вайск. службе. З дапамогай войска і свабодных беднякоў скінуў алігархію і быў абвешчаны палкаводцам з неабмежаванымі паўнамоцтвамі. Адваяваў у Карфагена амаль усе грэч. гарады Сіцыліі, в-аў Керкіра (Корфу). Каля 305 прыняў тытул «цара сіцылійцаў». Памёр у час паходу ў Паўд. Італію.

Агат.

Агаткі.

**АГАФО́НЕНКА** Таіса Паўлаўна (н. 29.3.1927, г. Кляшчэле Беластоцкага ваяв., Польшча), майстар мастацкага саломапляцення. Дачка В.І.*Гаўрылюк*. Скончыла Мінскае маст. вучылішча (1957). Працуе на Мінскай мастацка-галантарэйнай ф-цы (з 1965), дзе заснавала промысел *саломапляцення*. Аддае перавагу кампазіцыям на матывы нар. святаў і абрадаў, анімалістычнаму жанру.

**АГА́-ХАН**, тытул *імама* мусульманскай шыіцкай секты *ісмаілітаў*. Нададзены шахам Ірана ў сярэдзіне 19 ст. 46-му

Т.Агафоненка. Птушкі.

імаму Хасану Алі-шаху, пасля якога тытул пераходзіў да яго нашчадкаў: А.-х. II — Алі-шах (п. 1885); А.-х. III — Султан Махамед-шах (1877—1957) прадстаўляў у 1934—37 у Лізе нацый Індыю; А.-х. IV [з 1957 — шах Карым аль-Хусейні (н. 1937)].

**АГАХАНЯ́НЦ** Акмір Егішавіч (н. 5.1.1927, С.-Пецярбург), фізіка-географ. Акад. Пятроўскай акадэміі навук і мастацтваў (1993). Д-р геагр. н. (1968), праф. (1969). Засл. дз. нав. Таджыкістана (1990). Скончыў Ленінградскі пед. ін-т (1948). Працаваў у АН Таджыкістана, Калінінградскім ун-це. З 1970 нам. дырэктара Цэнтр. бат. сада АН Беларусі, з 1971 у Бел. пед. ун-це. Навук. працы па бат. геаграфіі і геаэкалогіі пазатрапічнай Еўразіі.

*Тв.:* Аридные горы СССР. М., 1981; Ботаническая география СССР. Мн., 1986; Ökologie der Erde. Bd. 3. Spezielle Ökologie der Gemäßigten und Arktischen Zonen Euro-Nordasiens. Stuttgart, 1994 (разам з З.В.Брэкле).

**АГА́ЦІЯР**, паводле дравідскай міфалогіі, адзін з ведычных мудрацоў, які

прынёс на Пд Індыі *тамільскую мову*, пазнаную ім ад бога *Шывы*. А. прыпісваецца стварэнне першага тамільскага грамат. трактата «Агаціям».

**АГАЯ́Н** Газарос (16.4.1840, Тбілісі — 3.7.1911), армянскі педагог, пісьменнік. У 1870—86 выкладчык і інспектар школ у Арменіі і Грузіі. Выступаў за дэмакратызацыю адукацыі, адстойваў ідэі жаночай адукацыі, навучання на роднай мове. Аўтар падручнікаў арм. мовы, прац па выхаванні, методыцы выкладання мовы. Дэмакр. погляды выкладзены ў рамане «Дзве сястры» (1872), мемуарах «Аруцюн і Манвел» (1867) і «Галоўныя падзеі майго жыцця» (1893), казках для дзяцей.

**АГБАМО́ША** (Ogbomosho), горад на ПдЗ Нігерыі. 484,7 тыс. ж. (1976). Вузел аўтадарог. Гандаль какава-зярнятамі, пладамі алейнай пальмы, ямсам. Абутковая прам-сць. Саматужная вытв-сць тканіны.

**АГЕ́НТ** [ад лац. agens (agentis) які дзейнічае], 1) асоба, якая дзейнічае па даручэнні каго-н.; прадстаўнік установы, арг-цыі, упаўнаважаны. 2) А. дыпламатычны — афіц. асоба, якая ажыццяўляе знешнепаліт. прадстаўніцтва. У прыватнасці, А. з'яўляюцца дыпламат. прадстаўнікі і персанал пасольстваў, місій. А. консульскі — у практыцы некаторых дзяржаў службовая асоба консульскай установы. 3) А. разведкі — асоба, якая нелегальна выконвае заданні разведвальных органаў якой-н. краіны. 4) У навук. тэрміналогіі — дзейная прычына, якая выклікае пэўныя з'явы (у прыродзе, арганізме чалавека і інш.).

**АГЕ́НЦТВА**, 1) арганізацыя, якая за абумоўленую плату выконвае пэўныя даручэнні фіз. або юрыд. асоб (даверніка́ў). Аб'ём, парадак і ўмовы агенцкага абслугоўвання фіксуюцца ў дагаворы паміж А. і даверні́кам, ад імя, за кошт і ў інтарэсах якога А. дзейнічае. 2) Прадстаўніцтва, аддзяленне якой-н. установы ці прадпрыемства, напр. тэлегр. А., трансп. А., *Агенцтва друку*, А. літаратурнае.

**АГЕ́НЦТВА ДРУ́КУ**, арганізацыя, якая займаецца зборам, перапрацоўкай і забеспячэннем інфармацыяй перыяд. выданняў, радыё, тэлебачання, урадавых структур, грамадскіх арг-цый і прыватных асоб. А.д. збіраюць інфармацыю без абмежавання тэматыкі, характару і спосабу пераказу, у т.л. фота- і кінаінфармацыю, або маюць акрэслены профіль паводле віду інфармацыі (інфармацыйныя, публіцыстычныя, рэкламныя, фотаагенцтвы), тэматыкі (эканам., навуковыя, фінанс., спарт. і інш.) ці прыналежнасці да пэўных слаёў грамадства (маладзёжныя, жаночыя і інш.). Падзяляюцца на міжнар., рэгіянальныя, нац. і мясцовыя. Большасць нац. А.д. з'яўляюцца афіцыйнымі (прадстаўляюць пункт гледжання ўрада), паўафіцыйнымі (прадстаўляюць пункт гледжання колаў, набліжаных да ўрада), незалежнымі (звязаныя з рознымі паліт. эканам. групоўкамі).

Узніклі з развіццём перыяд. друку і ўдасканаленнем тэхнікі сувязі. Першыя А.д. заснавалі Ш.Авас (1835, Парыж), Б.Вольф (1894, Берлін) і П.Рэйтэр (Лондан). У 1870 агенцтвы Аваса, Рэйтэра і Вольфа падзялілі сферы ўплыву. У канцы 19 ст. вырасла значэнне амер. агенцтва *Асашыэйтэд Прэс* (АП). У 1904 створана Санкт-Пецярбургскае тэлегр. агенцтва. У 1-й чвэрці 20 ст. ўзніклі нац. агенцтвы ў краінах Цэнтр. і Усх. Еўропы: Тэлеграфнае агенцтва Савецкага Саюза (ТАСС), ЧТК у Чэхаславакіі, ПТА у Польшчы і інш. З выкарыстаннем радыётэлеграфа (1919) і тэлетайпа (1929) колькасць А.д. павялічылася. У 1945 існавалі 55 А.д. ў 30 краінах, у 1991 — каля 220 агенцтваў у 140 краінах. Узрасло значэнне амер. агенцтва АП і *Юнайтэд Прэс Інтэрнэшанал* (ЮПІ). У Францыі створана агенцтва *Франс Прэс* (АФП, 1944), у Германіі — *Дойчэ Прэсэагентур* (ДПА). Усе яны, разам з італьян. АНСА, іісп. ЭФЭ і яп. *Кіода*

Агінальныя сям'і акружнасцяў з цэнтрамі на адной прамой.

*Цусін* найб. вядомыя на сусв. рынку інфарм. агенцтваў. У незалежных дзяржавах б. СССР дзейнічаюць А.д.: РІА — Навіны, *ІТАР—ТАСС*, *Інтэрфакс*, Пастфактум (Расія), ЭЛЬТА (Літва), ЭТА (Эстонія), Укрінфарм (Украіна), Азерінфарм (Азербайджан), Арменпрэс (Арменія) і інш.

На Беларусі дзейнічаюць афіц. дзярж. *Беларускае тэлеграфнае агенцтва* (БЕЛТА, з 1931; у 1991 — кастр. 1995 Беларускае інфармацыйнае агенцтва, БелІНФАРМ) і таксама недзярж. інфарм. службы *Беларускае прыватнае агенцтва навін* (БелаПАН), агенцтва «Павет», *Рэклама, інфармацыя, дайджэст* (РІД).

Апрача ўжо агульнавядомых тэхн. сродкаў перадачы інфармацыі (тэлекс, радыётэлефон, тэлефакс і інш.) усё большае выкарыстанне знаходзяць электронныя сродкі (тэлетэкст, дыстанцыйны набор, сістэма аўтам. кіравання і апрацоўкі інфармацыі). З 1970 А.д. выкарыстоўваюць спадарожнікавую сувязь.

*Н.К.Мазоўка.*

**АГЕ́НЦТВА ПА ШМАТБАКО́ВАЙ АХО́ВЕ ІНВЕСТЫ́ЦЫЙ**, Міжнароднае агенцтва па гарантыях інвестыцый (Multilateral investment guarantee agency), спецыялізаваная міжнар. арг-цыя ААН. Уваходзіць у *Сусветны банк*. Засн. ў 1988. Асн. мэты: доўгатэрміновае страхаванне прыватных інвестыцый на развіццё краін-удзельніц на выпадак рызыкоўных паліт. сітуацый (ахова ад рызыкі экспрапрыяцыі, незаконнага пераводу плацяжоў, ваеннай і грамадз. нестабільнасці і інш.), адкрыццё дарадчых і кансультацыйных службаў. У крас. 1992 аб'ядноўвала 77 краін-удзельніц, у т.л. Рэспубліку Беларусь (з 1992).

**А́ГЕР ПУ́БЛІКУС** (лац. ager publicus грамадскае поле), у Стараж. Рыме назва зямель заваяваных гарадоў і абшчын, ператвораных у рым. дзярж. ўласнасць. Пазней большасць іх захоплена патрыцыямі. Пытанне аб даступнасці да А. п. і іх перадзеле было адным з асн. патрабаванняў плебеяў у барацьбе супраць патрыцыяў і выклікала прыняцце шматлікіх агр. законаў.

**АГЕСІЛА́Й II** (каля 442 — каля 358 да н.э.), цар *Спарты* [401—358 да н.э.], палкаводзец, дыпламат. У 396—394 паспяхова ваяваў з Персіяй, але адкліканы ў сувязі з *Карынфскай вайной* (395—387). Пасля *Анталкідава міру* 387 (або 386) аднавіў гегемонію Спарты ў Грэцыі. У 378—362 ваяваў з *Эпамінондам*, у 361—360 удзельнічаў у вайне егіпцян з персамі. Памёр у час вяртання з Егіпта.

**АГІ́ВЫ**, дугападобныя папярочныя палосы лёду светлага ці цёмнага колеру на ледавіковых языках, павернутыя выпукласцямі ў напрамку руху *ледавікоў*. Сумарная шырыня пары палос (адной цёмнай і адной светлай) роўная гадавому зрушэнню ледавіковай паверхні. А. з'яўляюцца каля падножжа ледаспадаў у выглядзе хвалепадобных дэфармацый, якія пры руху ўніз па ледавіку спачатку памяншаюць сваю амплітуду, потым знікаюць і змяняюцца палосамі рознага колеру. Мяркуюць, што цёмныя палосы ўзнікаюць на ўчастках лёду, якія прайшлі праз ледаспад у перыяд *абляцыі*, светлыя — на ўчастках, што прайшлі тую ж зону ў перыяд *акумуляцыі*.

**АГІ́ДНАЕ**, катэгорыя *эстэтыкі*, праз якую вызначаюць негатыўную эстэт. каштоўнасць прадмета́ў і з'яў рэчаіснасці. А. — антыпод *прыгожаму*, але цесна звязана з ім і інш. эстэт. катэгорыямі (*узнёслым*, *камічным*, *трагічным*), таму што ў негатыўнай і скрытай форме сцвярджае пазітыўны эстэт. ідэал. А. ўвасабляе частку агульнай карціны развіцця чалавека (дабро і зло, прыгожае і А.), што было выкарыстана ў тэорыі эстэтыкі і практыцы мастацтва Адраджэння і Асветніцтва. У сучасным мастацтве таксама прасочваецца тэндэнцыя ўвасаблення А. ў спалучэнні з вонкавым аздабленнем — як спроба пашырыць разнастайнасць мастацтва (*дэкадэнцтва*) або як новы імпульс павышэння цікавасці да мастацтва (фільмы «жахаў»).

*В.А.Салееў.*

**АГІ́ЕВІЧ** Уладзімір Іванавіч (26.9.1910, в. Пухавічы Жыткавіцкага р-на Гомельскай вобл. — 4.10.1952), бел. крытык і літ.-знавец. Скончыў Магілёўскі пед. ін-т (1937). Друкаваўся з 1928. Найб. значныя працы пра творчасць Я.Купалы, Я.Коласа, пісьменнікаў бел. паэзію. Яго творы спрыялі пераадоленню вульгарызатарскіх схем і догмаў у бел. крытыцы.

*Тв.*: Літаратура і жыццё. Мн., 1954.

**АГІНА́ЛЬДА** (Aguinaldo) Эміліо (22.3.1869—6.2.1964), філіпінскі паліт. дзеяч. Узначальваў антыіспанскае паўстанне 1896—97. З 1897 кіраўнік урада, у час *амерыкана-філіпінскай вайны*

*1899—1901* прэзідэнт Філіпінскай рэспублікі. У 1901 узяты ў палон амер. войскамі; заклікаў народ спыніць супраціўленне. У 1942—44 чл. марыянетачнай Дзярж. рады, створанай на Філіпінах японскімі акупантамі.

**АГІНА́ЛЬНАЯ** с я м ' і л і н і й, лінія, якая ў кожным сваім пункце датыкаецца да адной лініі сям'і. Напр., усякая крывая з'яўляецца А. для сям'і сваіх датычных; А. сям'і акружнасцяў адналькавага радыуса R з цэнтрамі на адной прамой — пара прамых, кожная з якіх ляжыць на адлегласці R ад лініі цэнтраў (гл. рыс.). Ураўненне А. сям'і ліній на плоскасці, якія вызначаюцца ўраўненнем f (x, y, C) = 0, можна знайсці з сістэмы f (x, y, C) = 0, $f_C$ (x, y, C) = 0 выключэннем параметра C пры ўмове, што f (x, y, C) мае неперарыўныя першыя частковыя вытворныя па ўсіх пераменных.

**АГІ́НСКАГА ПЛАН 1811**, праект аднаўлення ВКЛ у складзе Рас. імперыі, прапанаваны сенатарам М.К.*Агінскім* імператару Аляксандру I. Адлюстраваў імкненне бел.-літ. шляхты да адм. і прававой самастойнасці краю і гатоўнасць цара пайсці на пэўную лібералізацыю палітыкі ў зах. губернях, каб нейтралізаваць пранапалеонаўскія настроі мясц. знаці. Прадугледжваў заснаванне з Гродзенскай, Віленскай, Мінскай, Віцебскай, Магілёўскай, Кіеўскай, Падольскай, Валынскай губ., Беластоцкай вобл. і Цярнопальскай акр. асобнай правінцыі пад назвай ВКЛ з гал. горадам Вільня і пад кіраваннем імператарскага намесніка; стварэнне ў краі вышэйшых дзярж. судовых і інш. органаў. Планавалася склікаць сойм, увесці канстытуцыю і паступова скасаваць прыгоннае права. Пад націскам кансерватыўных колаў, якія ўбачылі ў адраджэнні ВКЛ пагрозу тэр. цэласнасці Расіі, Аляксандр I не змог зацвердзіць А.п., але ўсё ж праект садзейнічаў прымірэнню ўрада з мясц. шляхтай напярэдадні вайны 1812: былі прыняты законы 1811 аб падатковых ільготах і інш.

*В.В.Антонаў, С.С.Рудовіч, В.В.Швед.*

**АГІ́НСКАЕ**, пасёлак гар. тыпу ў Расіі, цэнтр *Агінскай Бурацкай аўтаномнай акругі*. За 37 км ад чыг. ст. Магойтуй у даліне р. Ага (бас. Амура). Засн. ў 1811. 9,2 тыс. ж. (1994). Харч. прам-сць. Краязнаўчы музей. *К.Р.Кірпенка.*

**АГІ́НСКАЯ БУРА́ЦКАЯ АЎТАНО́МНАЯ АКРУ́ГА**, у складзе Рас. Федэрацыі, на Пд Чыцінскай вобл. Утворана 26.9.1937 з Агінскага аймака (Бурат-Мангольскай АССР). Пл. 19 тыс. км². Нас. 79,6 тыс. чал. (1994), гарадскога 30%; пераважаюць буряты, рускія, у зах. ч. — эвенкі. Сярэдняя шчыльн. 3,3 чал. на 1 км², больш заселена ўсх. частка. Адм. ц. — пас. гар. тыпу *Агінскае*.

Размешчана на Пд Забайкалля. Паверхня пераважна гарыстая (найб. г. Алханай, 1663 м). Клімат рэзка кантынентальны. Зіма халодная, маласнежная, лета гарачае, сярэдняя т-ра студз. -24 °С, ліп. 18 °С. Ападкаў каля 400 мм за год. Найб. рэкі — Анон, Аленгуй. Шмат прэсных і салёных азёраў. Глебы ў гарах падзолістыя, шэрыя лясныя, на раўнінах карбанатныя, каштанавыя, чарназёмныя, сустракаюцца саланчакі. Расліннасць стэпавая і лесастэпавая, у гарах на выш. 1000 м — лістоўнічныя лясы (у асн. даурская лістоўніца).

Горназдабыўная, лясная і лесанарыхтоўчая, лёгкая, харч. прам-сць. У сельскай гаспадарцы пераважае мясная і мяса-малочная жывёлагадоўля, пашавая танкарунная авечкагадоўля. Вырошчваюць збожжавыя (пшаніца, авёс, ячмень) і кармавыя культуры. Асн. від транспарту — аўтамабільны. На У праходзіць чыг. Карымская—Забайкальск.

**АГІ́НСКІ** Міхал Казімір (1730 — 31.5.1800), дзярж. дзеяч Рэчы Паспалітай, кампазітар, пісьменнік, мецэнат. З роду *Агінскіх*. Атрымаў муз. адукацыю (ігры на скрыпцы вучыўся ў Дж. Б. *Віёці*). З 1748 пісар польны літ., з 1764 ваявода віленскі, з 1768 гетман вял.

літоўскі. Адзін з кандыдатаў Кацярыны II на польскі трон. У 1771 перайшоў на бок барскіх канфедэратаў (гл. *Барская канфедэрацыя 1768*), але яго войска было разбіта і А. эмігрыраваў. У 1775 вярнуўся на Беларусь. Жыў у Слоніме, дзе пабудаваў некалькі прамысл. прадпрыемстваў, друкарню, стварыў тэатр і капэлу, балетную і муз. школы (гл. *Слонімская капэла Агінскага*, *Слонімскі тэатр Агінскага*, *Слонімская балетная школа*, *Слонімская музычная школа*). Аўтар опер «Зменены філосаф» (1771), «Елісейскія палі» (1788; верагодна, з Ф.Марыні), як мяркуюць, таксама «Сілы свету» і «Становішча саслоўяў» (1784), скрыпічных п'ес, рамансаў, у т.л. аднаго з першых вядомых вак. цыклаў «Да Касі». Займаўся і літ. дзейнасцю (оперныя лібрэта, вершы). Выдаў «Гістарычныя і маральныя аповесці» (1782), «Байкі і нябайкі» (1788). Па яго ініцыятыве і на яго сродкі пабудаваны *Агінскі канал*.

*Літ.*: Ц е х а н а в е ц к і А. Міхал Казімір Агінскі і яго «сядзіба музаў» у Слоніме: Пер. з нім. Мн., 1993. *А.А.Саламаха.*

**АГІ́НСКІ** Міхал Клеафас (7.10.1765, Гузаў каля Варшавы — 15.10.1833), дзярж. дзеяч Рэчы Паспалітай, кампазітар, літаратар. З роду *Агінскіх*. З 1789 надзвычайны пасол у Галандыі, выконваў дыпламат. місію ў Лондане. У 1791 у Магілёве прысягнуў Кацярыне II, чым захаваў маёнткі ва ўсх. Беларусі. Падтрымаў Канстытуцыю 3 мая 1791. Пасля перамогі *Таргавіцкай канфедэрацыі 1792* эмігрыраваў у Прусію, яго ма-

Міхал Клеафас Агінскі.

Міхал Казімір Агінскі.

ёнткі былі канфіскаваны; вяртанне на радзіму і зварот маёмасці былі абумоўлены яго ўступленнем у канфедэрацыю. Дэпутат Чатырохгадовага (1788—92) і Гродзенскага (1793) соймаў. У 1793—94 падскарбі вял. літоўскі. У час *паўстання 1794* увайшоў у склад Найвышэйшай літ. рады. Сфарміраваў на свае сродкі батальён стралкоў і камандаваў ім у некалькіх бітвах. У жн. 1794 зрабіў рэйд да Дынабурга (цяпер Даўгаўпілс). Змагаўся супраць прускіх войскаў. Пасля задушэння паўстання жыў у Вене, Венецыі, Парыжы. У 1802 вярнуўся ў свой маёнтак Залессе каля Смаргоні. У 1810 атрымаў званне сенатара. Прапанаваў імператару Аляксандру I праект аднаўлення ВКЛ у складзе Рас. імперыі (гл. *Агінскага план 1811*). Пасля адышоў ад паліт. дзейнасці. З 1823 жыў у Італіі. Вядомы як кампазітар. Ігры на фп. вучыўся ў Ю. Казлоўскага, на скрыпцы — у Дж.Б.Віёці. Кампазітарскую дзейнасць пачаў у 1790-я г. стварэннем маршаў і баявых песень, пашыраных сярод паўстанцаў 1794. Аўтар папулярных паланэзаў, у т.л. паланэза ля-мінор «Развітанне з Радзімай», фп. п'ес, рамансаў, адметных лірызмам, меладычнасцю, нар.-песеннымі традыцыямі, а таксама аднаактовай оперы «Зеліс і Валькур, або Банапарт у Каіры» на ўласнае лібрэта (1799). А. належаць трактат «Лісты пра музыку» (1828, выд. на польск. мове ў 1956), «Мемуары пра Польшчу і палякаў з 1788 да 1815 г.» (т. 1—4, 1826—27, на франц. мове).

*Літ.*: Б э л з а И. Михал Клеофас Огиньский. 2 изд. М., 1974.

**АГІ́НСКІ БОЙ 1942.** Адбыўся ў Вял. Айч. вайну паміж партыз. атрадам імя Шчорса (камандзір П.В. Пранятін) і ням.-фаш. захопнікамі 13.9.1942 у раёне *Агінскага канала*. Атрад з баямі выйшаў 10—13.9.1942 да 10-га шлюза, захопле-

нага карнікамі (каля 100 гітлераўцаў), частка атрада перайшла ўброд р. Шчара і ўдарыла ў фланг праціўніка, асн. сілы партызан атакавалі ворага і ў выніку 5-гадзіннага бою знішчылі больш за 60 гітлераўцаў, захапілі зброю, боепрыпасы.

**АГІ́НСКІ КАНА́Л**, у Беларусі, у Пінскім і Іванцэвіцкім р-нах Брэсцкай вобл., злучае басейны рэк Нёман і Прыпяць праз рэкі Шчара і Ясельда; ч. былога Дняпроўска-Нёманскага воднага шляху. Даўж. (разам з Выганашчанскім воз.) 54 км. Складаецца з 2 ч., якія пачынаюцца з воз. Выганашчанскае: 1-я (даўж. 3,5 км) упадае ў Шчару за 3,5 км на Пн ад воз. Выганашчанскае, 2-я (даўж. 46 км) — у Ясельду за 1 км на ПнУ ад в. Мерчыцы Пінскага р-на. Прымае сцёк з густой сеткі асушальных каналаў, у т.л. з Краглевіцкага (справа) і Хварашчанскага (злева).

Будаваўся ў 1767—83 па ініцыятыве М.К. Агінскага для перавозу грузаў, пераважна лесу. У 1799—1804 вяліся работы па яго добраўпарадкаванні. У 1-ю сусв. вайну гідратэхн. збудаванні разбураны, потым адноўлены. Да 1941 выкарыстоўваўся для суднаходства і лесасплаву. У Айч. вайну шлюзы і плаціны разбураны; гасп. значэння не мае.

**АГІ́НСКІ СТЭП**, узвышаная раўніна ў Забайкаллі, у Рас. Федэрацыі, на спадзістых схілах хрыбтоў і далін рэк бас. Агі (прыток Анона). Даўж. каля 100 км. Выш. 600—900 м. Расліннасць — кавыль, ціпчак, палын, піжма. Большая ч. тэрыторыі пад с.-г. ўгоддзямі.

**АГІ́НСКІЯ**, старадаўні магнацкі род герба «Агінец», прадстаўнікі якога адыгрывалі значную ролю ў дзярж., грамадска-паліт. і культ. жыцці Беларусі, Літвы, Польшчы і Расіі. Сваё паходжанне выводзілі ад Рурыкавічаў, у 17 ст. прынялі каталіцтва. У 17 ст. род падзяліўся на 2 галіны — старэйшую (у 17 — пач. 19 ст. карысталася графскім тытулам) і малодшую (страціла княжацкі тытул). Найб. вядомыя з роду А.:

Аляксандр (каля 1585—1667), сын Багдана, ваявода менскі (1645), кашталян трокскі (1649). Удзельнічаў у войнах супраць шведаў, рускіх, туркаў. Шыман Кароль (каля 1620—99), сын Самуэля, падкаморы віцебскі (1654), мечнік літоўскі (1680), ваявода мсціслаўскі (1685). Марцыян (1632—26.1.1690), сын Аляксандра, ваявода трокскі (1670), канцлер вялікі ВКЛ (1684). Ваяваў супраць шведаў, рускіх. Удзельнік падпісання *«Вечнага міру» 1686* з Расіяй. Ян (каля 1625—24.2.1694), сын Самуэля, маршалак ваўкавыскі (1657), пісар польны літоўскі (1668), ваявода мсціслаўскі (1672), ваявода полацкі і гетман польны літоўскі (1682). Ваяваў супраць рускіх, туркаў, татараў, удзельнік бітвы пад Венай 1683. Рыгор Антоні (?—17.11.1709), сын Яна, харужы вялікі літоўскі (1687), староста жмудскі (1698), гетман польны літоўскі (1703), маршалак Трыбунала ВКЛ (1706). У 1700 разбіў войска Сапегаў у бітве пад Алькенікамі. Прыхільнік Аўгуста II Моцнага і Пятра I. У 1700 у час Паўн. вайны 1700—21 ваяваў супраць шведаў. Ігнацы (каля 1698 — сак. 1775), маршалак Трыбунала ВКЛ (1732), маршалак вялікі ВКЛ (1750), кашталян віленскі (1768). Андрэй (13.4.1740—12.10.1787), сын Тадэвуша Францішка, маршалак Трыбунала ВКЛ (1760), мечнік літ. (1762), рэферэндар літ. (1771), сакратар вялікі ВКЛ (1773), кашталян (1778) і ваявода трокскі (1783). Міхал Клеафас, гл. *Агінскі* М.К. Міхал Казімір, гл. *Агінскі* М.К.

*А.П.Грыцкевіч.*

**А́ГІС IV** (каля 262—241 да н.э.), цар *Спарты* [245—241 да н.э.]. Правёў шэраг рэформаў для паляпшэння становішча грамадзян (касацыя даўгоў, перадзел зямлі, павелічэнне колькасці паўнапраўных грамадзян за кошт *перыэкаў*) і аднаўленне ваен. моцы дзяржавы. Разагнаў *эфораў*, адкрыў даўгавыя турмы і спаліў даўгавыя дакументы. Абвінавачаны ў імкненні да тыраніі і пакараны смерцю.

Да арт. **Агія-Трыяда.** Ваза з палаца. Каля 1500 да н.э.

**«АГІТПІЛАКА́Т»**, перыядычнае выданне Саюза мастакоў БССР. Выдаваўся ў 1966—90 Мінскім маст.-вытворчым камбінатам (72 плакаты на год). Плакаты адлюстроўвалі актуальныя для таго часу падзеі жыцця Беларусі. Выконваліся спосабам шоўкатрафарэтнага друку. У «А.» працавалі мастакі М.Гурло, Р.Данчанка, У.Жук, У.Крукоўскі, А.Чуркін, В.Шматаў і інш.

**АГІТПО́ЕЗД**, спецыяльна абсталяваны поезд, які выкарыстоўваўся як перасоўны агітпункт. Створаны ў грамадз. вайну 1918—20 для правядзення ідэалаг. работы, збору сродкаў для фронту. Быў укамплектаваны аркестрамі, харамі, фатографамі, забяспечваўся плакатамі, лістоўкамі і паліт. літаратурай.

**АГІЯГРА́ФІЯ** (ад грэч. hagios святы + *...графія*), жанр царкоўна-рэліг. л-ры, апавяданні пра жыццё святых. Гл. *Жыціе.*

**АГІ́ЯДЫ** (Agiadai), царская дынастыя ў *Спарце* ў сярэдзіне 6 — сярэдзіне 3 ст. да н.э. Правіла адначасова з дынастыяй *Эўрыпантыдаў*. Паходзіла, відаць, з ахейцаў, А. лічыліся нашчадкамі паўлегендарнага цара Агіса I. Вядомыя прадстаўнікі дынастыі: Клеамен I, Леанід [488—480 да н.э.], Паўсаній [408—394 да н.э.], Клеамен III [235—221 да н.э.].

**АГІ́Я-ТРЫЯ́ДА** (Hagia Triada), паселішча неаліту і бронзавага веку каля в. Агія-Трыяда на в-ве Крыт, адзін з цэнтраў *крыта-мікенскай культуры*. Захаваліся рэшткі палаца («царскай вілы»), пабудаванага *мінойцамі* каля 1600 да н.э. Складаўся з жылых і інш. памяшканняў, упрыгожаных фрэскамі, ванных пакояў, тэрас. Выяўлены культавае памяшканне з алтаром і ахвярныя рэчы (статуэткі, посуд і інш.), керамічны саркафаг з выявамі сцэн пахавальнага рытуалу. Заняпад А.-Т. звязаны з нашэсцем *ахейцаў* (сярэдзіна 15 ст. да н.э.).

**АГЛАБІ́ДЫ**, дынастыя араб. эміраў [800—909] у Іфрыкіі (Паўн. Афрыка). Заснавальнік — Ібрахім ібн аль-Аглаб [800—812], нам. абасідскага халіфа Харун ар-Рашыда. А. стварылі фактычна незалежную дзяржаву са сталіцай у Кайруане, захапілі Сіцылію, Калабрыю, вялі рэліг. барацьбу з харыджытамі, змагаліся са створаным імі імаматам Тахерт (паўд. ч. Іфрыкіі). Пасля падзення дынастыі А. улада перайшла да Фатымідаў (гл. *Фатымідаў халіфат*).

**АГЛАМЕРА́Т** (ад лац. agglomeratus далучаны, накоплены), 1) у геалогіі — рыхлыя скопішчы абломкаў горных парод няправільных контураў, вулканічных бомбаў і попелу, намнажэнні буйнаабломкавага матэрыялу асадкавага паходжання. Пры цэментацыі А. ўтвараюцца *брэкчыі*, *туфы*, *туфабрэкчыі*. 2) У металургіі — спечаныя ў кавалкі дробныя матэрыялы, пераважна рудныя канцэнтраты, дробназярністыя і пылападобныя руды і інш. Гл. *Агламерацыя.*

**АГЛАМЕРА́ЦЫЯ**, 1) у металургіі, тэрмахімічны працэс спякання дробназярністых ці пылападобных матэрыялаў рудная шыхты ў вял. кавалкі (агламераты). Уключае падрыхтоўку шыхты, спяканне яе, апрацоўку гарачага пеку, ахаладжэнне да 100 °С і сартаванне. Шыхта складаецца з дробнай сырой руды і яе канцэнтрату, паліва (дробны кокс ці антрацыт), флюсу (здробненая вапна і вапняк). А. адбываецца пры прадзіманні паветра цераз слой шыхты на каласніковых рашотках агламерацыйнай машыны і згаранні паліва (1500 °С); у выпадку сульфідных ру-

даў — пры акісленні (працякае з выдзяленнем цеплаты). Агламерат выкарыстоўваецца ў чорнай металургіі, у каляровай — для вытв-сці алюмінію, нікелю і свінцу. 2) У мікрабіялогіі, утварэнне мікраарганізмамі намнажэнняў у вадкасцях або тканках у выніку змены фіз. і хім. уласцівасцяў мікробных клетак (пад уздзеяннем імунных целаў і інш.).

**АГЛАМЕРА́ЦЫЯ НАСЕ́ЛЕНЫХ ПУ́НКТАЎ**, гл. *Гарадская агламерацыя.*

**АГЛАПАРЫ́Т**, штучны порысты буд. матэрыял. Атрымліваецца спяканнем гліністых парод або адходаў абагачэння і спальвання вугалю (шлакаў, попелу) з далейшым драбненнем на фракцыі (друз, гравій, пясок). Выкарыстоўваецца як запаўняльнік для вырабу лёгкіх (аглапарытабетон), гарачаўстойлівых і кіслотатрывалых бетонаў, як цеплаізаляцыйныя, водапаглынальныя і водазатрымныя засыпкі. Тэхналогія вытвсці А. з рыхлых гліністых парод распрацавана ў НДІ будматэрыялаў (Мінск, 1958).

**АГЛЮЦІНАТЫ́ЎНЫЯ МО́ВЫ** (ад лац. agglutinare прыклейваць), мовы, у якіх словы і іх формы ўтвараюцца пераважна праз аглюцінацыю (спалучэнне граматычна адназначных афіксаў з нязменным коранем). Напр., у цюркскіх мовах -lar- — суфікс множнага л.: тур. bulut «воблака», bulutlar «воблакі»; каз. ара «піла», аралар «пілы». Характэрныя рысы А.м. — стандартная парадыгма словазмянення, адсутнасць унутранай флексіі, адназначнасць афіксаў, фіксаваны націск, строгі парадак слоў і інш. Да А.м. адносяцца вял. колькасць моў Азіі і Еўропы (цюркскія, фіна-угорскія, мангольскія, тунгуса-маньчжурскія, японская, карэйская і інш.), Акіяніі (папуаскія, інданезійскія, мікранезійскія), Афрыкі (банту, мандэ, бантоідныя).

**АГЛЯ́Д**, 1) сцісла абагульненае паведамленне (у друку, на радыё і тэлебачанні) пра падзеі, што адбыліся за пэўны прамежак часу ў грамадскім жыцці, навуцы, тэхніцы, мастацтве, л-ры (А. міжнар. падзей, навуковы, тэатральны, літаратурны). 2) Від паказу, у якім сродкамі тэатра (кіно, радыё, тэлебачання, эстрады) падаюцца падзеі, з'явы, факты жыцця. Складаецца з асобных сцэн, эстрадных, харэагр., муз., вак. нумароў, аб'яднаных агульным сюжэтам. Узнік у 1830-я г. ў Францыі, меў надзённы характар. З канца 19 ст. ператварыўся ў пацешлівыя відовішчы (*рэвю, мюзік-хол*). У бел. нар. тэатры своеасаблівай формай А. былі ігрышчы, выступленні скамарохаў, *школьнага тэатра*, *батлейкі*, у якіх дэманстраваліся бытавыя сцэны з тагачаснага жыцця. У 1920—30-я г. форму А. мелі агітац.-маст. паказы на актуальныя паліт. ці вытворча-быт. тэмы. Выкарыстоўваецца ў сучасных тэатрах сатыры і мініяцюр. 3) Форма паказу дасягненняў прафес. ці самадзейнага мастацтва — выстаўка, дэкада, конкурс, паказ, свята, *фестываль* і інш.

**АГЛЯЕ́ННЕ ГЛЕ́БЫ**, глебаўтваральны працэс, які адбываецца ў анаэробных умовах з удзелам мікраарганізмаў, пры наяўнасці арган. рэчыва і пастаянным або працяглым абвадненні асобных гарызонтаў або ўсяго профілю глебы. Назіраецца амаль усюды ў глебах рознага генезісу і мех. складу, найчасцей у гумідных глебах. Вонкавая прыкмета А.г. — спецыфічная афарбоўка аглеяных гарызонтаў: ад белавата-шызага ці шэра-блакітнаватага ў лёгкіх глебах да шызавата-сіняга або зеленаватага ў поймавых і чарназёмападобных. Гл. таксама *Глей*.

**АГНАСТЫЦЫ́ЗМ** (ад грэч. agnōstos недаступны пазнанню), філасофскае вучэнне, паводле якога немагчыма пазнанне аб'ектыўнага свету, яго сутнасці і заканамернасці развіцця, дасягненне абсалютнай ісціны; крайняя форма

Агнёўкі: *1* — лугавы матылёк; *2* — сцябловы матылёк; *3* — агнёўка шышкавая; *4* — агнёўка паўднёвая свірнавая; *5* — агнёўка вялікая васковая.

*скептыцызму*. Роля навукі абмяжоўваецца толькі пазнаннем з'яў. Тэрмін уведзены ў 1863 англ. прыродазнаўцам Т.Гекслі. Ідэі А. прасочваліся яшчэ ў ант. філасофіі (Пратагор, сафісты). Найб. паслядоўна А. прадстаўлены ў вучэннях Д. *Юма* і К.*Канта*. Юм лічыў, што ўсё пазнанне звязана толькі з вопытам і прынцыпова не выходзіць за яго межы, а таму нельга меркаваць пра адносіны паміж вопытам і рэальнасцю. Кант абгрунтоўваў А. увядзеннем і размежаваннем паняццяў «рэч у сабе» (недасягальная для пазнання) і «рэч для нас» (у працэсе пазнання якой утвараецца вобраз гэтай рэчы). Пазнаючы вобраз, розум імкнецца пазнаць і «рэч у сабе», але гэта яму не ўдаецца, паколькі ён валодае магчымасцямі толькі для пазнання вобраза рэчы, таму розум канчаткова заблытваецца ва ўзаемна супярэчлівых выказваннях аб прадмеце (*антыномія*х), якія дапускаюць пераканаўчае лагічнае абгрунтаванне. А. параджаецца абсалютызацыяй, празмерным абасабленнем і проціпастаўленнем тэорыі і практыкі, пазнання і рэчаіснасці, суб'екта і аб'екта пазнання. Разнавіднасцю А. з'яўляецца *іерогліфаў тэорыя*, *неапазітывізм*, *экзістэнцыялізм* і інш.

*М.В.Анцыповіч.*

**АГНА́ТЫ**, група ніжэйшых пазваночных жывёл; гл. *Бяссківічныя.*

**АГНЁЎ** Сяргей Іванавіч (17.11.1886, Масква — 20.12.1951), рус. заолаг. Д-р біял. н. (1935), праф. (1930). Засл. дз. нав. Расіі (1947). Скончыў Маскоўскі ун-т (1910). Заснавальнік маскоўскай школы тэрыёлагаў (даследчыкаў млекакормячых). Вывучаў птушак Белавежскай пушчы. Аўтар падручнікаў і навук.-папулярных кніг. Дзярж. прэміі СССР 1942, 1951.

*Тв.:* Звери СССР и прилежащих стран: (Звери Восточной Европы и Северной Азии). Т. 1—7. М.; Л., 1928—50; Зоология позвоночных. 4 изд. М., 1945; Очерки экологии млекопитающих. М., 1951.

**АГНЁЎКА**, род грыбоў, гл. *Лускаўніца.*

**АГНЁЎКІ** (Pyralididae), сямейства дзённых матылёў. У сусв. фауне каля 20 тыс. відаў. Пашыраны на ўсіх мацерыках, акрамя Антарктыды. Жывуць у пустынях, стэпах, лясах, на лугах, некаторыя — на водных раслінах, у прадуктовых складах, збожжасховішчах, млынах. На Беларусі 150 відаў; найб. вядомыя: лугавы і сцябловы (кукурузны) матылькі (пашкоджваюць буракі, каноплі, бабовыя, сланечнік, кукурузу, проса), паўднёвая свірнавая А. (шкодзіць зернебабовым); шышкавая А. (псуе хвою і лісце хваёвых і мяшаных лясоў), млынавая і мучная А. (пашкоджваюць зерне і харч. прадукты); вял. васковая А. (псуе воск і вашчыну ў вуллях).

Дробныя і сярэдніх памераў: крылы (размах 1—5 см) складаюцца трохвугольнікам ці абгортваюць цела трубачкай. Развіццё з поўным ператварэннем. Вусені жывуць звычайна ўнутры раслін (кормяцца каранямі, парасткамі, пладамі і г.д.) або ў скручаным лісці.

**АГНІ́**, у ведыйскай і індуісцкай міфалогіі бог агню, хатняга ачага, ахвярнага вогнішча; пасрэднік паміж людзьмі і багамі. У А. мноства іпастасяў: агонь на небе (сонца, маланка), агонь у водах,

агонь ахвярнага вогнішча; ён адначасова і стары і малады.

**АГНІ́ШЧА**, прыстасаванне, дзе ў старажытнасці распальвалі і зберагалі агонь, які служыў чалавеку для абагравання, прыгатавання ежы і абароны ад дзікіх звяроў. Рэшткі першых А. знойдзены на стаянках *пітэкантрапа* ва Усх. Афрыцы (больш за 1 млн. г. таму назад)

Ш.І.Агнюк.

Э.Агняцвет.

і *сінантрапа* ў Кітаі (каля 300 тыс. г. назад). На Беларусі найб. старажытныя А. вядомы з эпохі верхняга палеаліту (*Бердыж*, *Юравічы*).

**АГНІШЧА́НІН**, першапачаткова малодшы дружыннік стараж.-рус. князя, які кіраваў княжацкай гаспадаркай, дваром, слугамі. У 11—13 ст. старшы дружыннік, «княжой муж», баярын. Аб прывілеяваным становішчы А. сведчыць Руская праўда, якая за яго забойства вызначала двайны штраф у 80 грыўняў.

**АГНО́ЗІЯ** (ад *a*... + грэч. gnōsis пазнанне, распазнаванне), парушэнне працэсаў распазнавання навакольных прадметаў і з'яў пры захаванні свядомасці і адчувальнасці. Узнікае пры шырокім пашкоджанні пэўных аддзелаў кары вял. паўшар'яў галаўнога мозга. Адрозніваюць А. зрокавую («душэўная слепата»), калі хворы не пазнае знаёмыя прадметы, людзей (А. на людзей), але вастрыня зроку захавана, А. слыхавую — хворы не здольны распазнаваць гукі, А. адчувальную — немагчымасць распазнаваць знаёмыя прадметы на дотык (астэраагноз), А. нюхальную і смакавую — парушэнне распазнавання знаёмых прадметаў і рэчаў па іх паху і смаку. У некаторых выпадках хворы не арыентуецца ў частках свайго цела.

**АГНО́Н** (Agnon; сапр. Чачкес) Шмуэль Іосеф (17.7.1888, г. Бучач Цярнопальскай вобл., Украіна — 17.2.1970), ізраільскі пісьменнік. Самы значны твор — авантурны раман «Дачка на выданні» (1931). Аўтар псіхал. раманаў «Простая гісторыя» (1935), «Госць на адну ноч» (1938—39), «Зусім нядаўна» (1945), аповесцяў «Госць зайшоў пераначаваць» (1939), «У глыбінях мораў» (1952), зб-каў апавяданняў «Снапы» (1963), «Апавяданні для ўсёдаравання» (1967) і інш. У творах спалучэнне фальклорнага сюжэтаў і вобразаў з фантазіяй, іроніі са спачуваннем, рэлігійныя матывы. Нобелеўская прэмія 1966.

**АГНЯВА́Я ПАДРЫХТО́ЎКА**, 1) састаўная частка палявой вывучкі войскаў; асн. прадмет баявой падрыхтоўкі мотастралк. і танк. падраздзяленняў. Мае на мэце навучыць ваеннаслужачага дасканала валодаць зброяй (узбраеннем), весці разведку цэляў, вызначаць адлегласць да іх, хутка і трапна паражаць іх першымі выстраламі (чэргамі), выкарыстоўваць усе спосабы вядзення агню з улікам метэаралагічных і балістычных умоў і інш. Праводзіцца на занятках па вывучэнні зброі, боепрыпасаў і правілаў стральбы, на трэніроўках, вучэбных і кантрольных стрэльбах і інш. 2) Перыяд агнявога паражэння праціўніка перад атакай. Праводзіцца сіламі артылерыі, ракетных войск і авіяцыі для прарыву рубяжа абароны, пры ўводзе ў бой другіх эшалонаў (рэзерваў), а таксама ў абароне пры нанясенні контрударау. Спыняецца з пераходам наступаючых у атаку або змяняецца агнявой падтрымкай атакі.

Агні. Драўляная скульптура. 18—19 ст.

Да арт. **Агоўская размалёўка.** Пано. Размалёўка па шкле. 1960-я г. Вёска Крамно Драгічынскага раёна.

**АГНЯМЁТ**, зброя, прызначаная для паражэння жывой сілы праціўніка струменем агню запаленай сумесі, падпалу тэхн. сродкаў і матэрыяльных запасаў, стварэння ачагоў пажару. Складаецца з рэзервуара, брандспойта і запальніцы. Адрозніваюць А. ранцавыя (пераносныя), цяжкія пяхотныя (на двухколавым лафеце), механізаваныя (на самаходным шасі), танкавыя (асн. або дадатковае ўзбраенне), фугасныя (стацыянарныя з выкідам агнясумесі парахавым зарадам) і рэактыўныя (пераносныя — ружжо з рэактыўным снарадам з агнясумессю). Адлегласць вогнемятання ранцавых да 70 м, рэактыўных — да 800 м, астатніх — да 200 м. Упершыню А. выкарыстаны герм. войскамі ў 1915.

**АГНЯ́НАЎ** (Огнянов) Сава Петраў (24.5.1876, г. Канстанца, Румынія — 22.3.1933), балгарскі акцёр. На сцэне з 1902. З 1904 у Нар. т-ры (Сафія). У 1911—12 вывучаў мастацтва Маскоўскага маст. т-ра. Сярод роляў: Дынка («Вампір» А.Страшымірава), Рад Лупу, цар Іван Асен («Над безданню», «Барыслаў» І.Вазава), Рагожын («Ідыёт» паводле Ф.Дастаеўскага), Гамлет («Гамлет» У.Шэкспіра), доктар Ранк («Нора» Г.Ібсена), Цэзар («Цэзар і Клеапатра» Б.Шоу) і інш. Здымаўся ў кіно.

**АГНЯСТРЭ́ЛЬНАЯ ЗБРО́Я**, агульная назва сродкаў, у якіх для выкідання з канала ствала снарада (кулі, міны) выкарыстоўваецца сіла ціску ад згарання парахавых зарадаў ці спец. гаручых сумесяў. Бывае гладкаствольная і нарэзная, аднаразовая і аўтаматычная, баявая, спартыўная і паляўнічая; паводле абслугоўвання і выкарыстання — індывідуальная і калектыўная. Баявая А.з. падзяляецца на артылерыйскую (гарматы, мінамёты, гаўбіцы і інш.), стралковую (рэвальверы, пісталеты, аўтаматы, вінтоўкі, карабіны, кулямёты і інш.); да А.з. адносяцца таксама гранатамёты.

А.з. з'явіліся пасля вынаходства пораху і ўпершыню выкарыстана ў Кітаі ў 11 ст. У Еўропе, у т.л. на Беларусі, вядома з 14 ст. Выраблялася на Беларусі з канца 14 ст. У 16—18 ст. людвісарні (ліцейныя майстэрні), дзе адліваліся гарматы, існавалі ў Нясвіжы, Слуцку, Урэччы, Быхаве, Магілёве і інш. гарадах. Буйнейшыя вытворцы сучаснай А.з. і інш. ўзбраення — ЗША, Расія, Францыя і інш. прамыслова-развітыя краіны.

**АГНЯЦВЕ́Т** Эдзі (сапр. Каган Эдзі Сямёнаўна; н. 11.10.1913, Мінск), бел. паэтэса. Скончыла Мінскі пед. ін-т (1936). Друкуецца з 1929. Выдала зб-кі лірыкі «Вершы» (1938), «Вясновай раніцай» (1941), «Беларуская рабіна» (1959), «Жаданне» (1971), «Закаханым» (1986) і інш. Шмат піша для дзяцей: «Васількі» (1947), «Твае таварышы» (1959), «Доктар Смех» (1977), «На двары алімпіяда» (1984, Міжнар. гана-

ровы дыплом 1986), «Рэчка-рэчанька мая» (1991) і інш. На бел. мову пераклала творы франц. паэзіі («Краіна Паэмія», для дзяцей, 1962; «Выбраныя песні» П.Ж.Беранжэ, 1960; «Зямны акіян» Г.Апалінэра, 1973; «З табой» П.Элюара, 1980); у 1993 выдадзены зб. перакладаў «З французскай і бельгійскай паэзіі»). Па яе лібрэта пастаўлены оперы для дзяцей «Джанат» (1942, муз. Л.Шварца) і «Марынка» (1955, муз. Р.Пукста).

*Тв.*: Выбр. творы. Т. 1—2. Мн., 1976.

*Літ.*: Барстоk М.М. Эдзі Агняцвет // Беларуская дзіцячая літаратура. 2 выд. Мн., 1980.

**АГО́ГІКА** (ад грэч. agoge адвод, аднясенне), у музычным выкананні невялікія, часам не пазначаныя ў нотным тэксце адхіленні ад тэмпу і метра. У вак. музыцы садзейнічае гнуткасці, выразнасці выканання, падкрэслівае матыўнае гучанне, гарманічную структуру твора, сэнсавы змест.

**АГО́Л** Іосіф (Ізраіль) Іосіфавіч (2.12.1891, г. Бабруйск — 10.3.1937), украінскі генетык і філосаф. Акад. АН УССР (1934). Скончыў Маскоўскі ун-т (1923). У 1918—19 чл. і сакратар Мінскага губ. рэўкома, сакратар Мінскага гарвыканкома, нам. камісара па справах фінансаў БССР. Чл. ЦВК Літбела. З 1924 супрацоўнік Ін-та філасофіі, секцыі прыродазнаўчых навук Камуніст. акадэміі. Працаваў у ЗША па праблемах генетыкі дразафілы, з 1934 у АН УССР. Аўтар прац па праблемах генетыкі, арган. мэтазгоднасці, філас. пытаннях прыродазнаўства. У 1936 рэпрэсіраваны і расстраляны. Рэабілітаваны пасмяротна.

*Тв.*: Происхождение животных и человека. М., 1924; Диалектический метод и эволюционная теория. М.; Л., 1927.

**АГО́НІЯ** (ад грэч. agonia барацьба), згасанне асн. жыццёвых працэсаў у перыяд, які папярэднічае смерці. Суправаджаецца стратай свядомасці, парушэннем дыхання, згасаннем адчувальнасці, рэзкім спадам сардэчнай дзейнасці, памутненнем рагавіцы вока, сінявата-барвовым адценнем скуры. Працягласць А. — некалькі мінут, гадзіны.

**АГО́НЬ**, з'ява, звязаная з працэсам *гарэння*; уключае вонкавае і сенсорнае ўспрыманне яго чалавекам. Сляды А. археолагі знаходзяць пры раскопках паселішчаў сінантрапаў і неандэртальцаў.

Доўгі час людзі карысталіся прыродным А., які ўзнікаў пры самазагаранні дрэў і раслін ад маланкі, вывяржэння вулканаў, загарання прыроднага газу і інш., і падтрымлівалі гарэнне ў ямах і агнішчах. У пач. верхняга палеаліту людзі навучыліся здабываць А. ад трэння кавалкаў дрэва. Пазней (у пач. жал. веку) А. высякалі з крэменю пры дапамозе жал. крэсіва, з 19 ст. сталі выкарыстоўваць запалкі, запальнічкі. Авалоданне А. спрыяла канчатковаму аддзяленню першабытнага чалавека ад жывёльнага свету і зрабіла вызначальны ўплыў на развіццё агульначалавечай культуры і ўзаемаадносін паміж людзьмі. У стараж. беларусаў А. лічыўся радавым і хатнім бажаством, абаронцам хатняга ачага і лек. сродкам. Уяўленні пра яго надпрыродную сілу захаваліся ў рытуальных звычаях раскладваць купальскія вогнішчы, скакаць цераз іх парамі для «ачышчэння» і інш. Да канца 19 ст. на Беларусі існавалі ахвяраванні ў гонар А. (спальвалі першы сноп жыта перад тым як сушыць у асеці); «жывым агнём», г. зн. здабытым ад трэння кавалкаў дрэва, абносіліся паселішчы ў час эпідэміі і эпізоотыі, пасевы ў час засухі ці вымакання. Багамі А. ва ўсіх славян лічыліся *Сварожыч* і *Жыжаль*. Некаторыя народы Індыі, Ірана і цяпер пакланяюцца А.

**АГО́НЬ** (ваен.), стральба з розных відаў *агнястрэльнай зброі*, адзін з асн. сродкаў знішчэння і паражэння праціўніка.

Адрозніваюць А. адзіночнымі выстраламі, залпавы, бесперапынны; па напрамках — перакрыжаваны, франтальны, флангавы; можа быць беглы, кінжальны, масіраваны, метадычны і інш., з артыл. сістэм — сканцэнтраваны, рухомы і нерухомы загараджальны, паслядоўны, агнявы вал і інш. А. уключае таксама пуск ракет у звычайным начынні.

**АГО́ЎСКАЯ РАЗМАЛЁЎКА**, від бел. нар. творчасці; традыц. аздабленне



Да арт. **Агоўскія куфры.** Куфар. Размалёўка Т. Доўгер. 1950-я г. Вёска Агова Іванаўскага раёна.

алейнымі фарбамі мэблі, дываноў, шкляных пано — «карціна», рамак для фотаздымкаў, тканін для ўпрыгожання інтэр'ера хаты і інш. Была пашырана ў вёсках Агова, Опаль Іванаўскага, Здзітава, Жорнаўка, Спорава Бярозаўскага, Крамно Драгічынскага р-наў Брэсцкай вобл. ў канцы 19 ст. — 1960-х г. Выконвалася на дрэве, шкле, палатне, цыраце, паперы.

Асаблівай жывапіснасцю і характарам палі-хромнай размалёўкі, гармоніяй дэкору і формы вылучаюцца *агоўскія куфры*. Матывы А.р. — раслінныя (букеты, вазоны), зааморфныя (ластаўкі, галубы, зязюлі), антрапаморфныя («паненка», «кавалер»), геаметрычныя; часам уключаюць надпісы (добрае пажаданне, прозвішча майстра, год стварэння вырабу). А.р. мае шмат агульнага з паліхромнай аб'ёмнай вышыўкай гладдзю на адзенні, ручніках і інш. Сувеніры, рэчы хатняга ўжытку, мэбля, аздобленыя па матывах А.р., вырабляюцца на *Брэсцкай фабрыцы сувеніраў*, *Пінскай фабрыцы мастацкіх вырабаў*, майстрамі-надомнікамі. *М.Ф.Раманюк.*

**АГО́ЎСКІЯ КУ́ФРЫ**, вырабы бел. нар. майстроў з вёсак Агова, Опаль, Іванаўскага, Крамно, Заверша, Хомск Драгічынскага р-наў Брэсцкай вобл.

Промысел узнік у пач. 20 ст., найб. росквіту дасягнуў у 1950-я г. Паводле канструкцыі А.к. традыцыйныя: прамавугольная скрыня памерам 60 х 110 х 80 см з пукатым векам, на 4 метал. ці драўляных колцах, з 2 ручкамі на баках.

У пач. 20 ст. іх фарбавалі ў адзін колер, акоўвалі палосамі бляхі. У 1920—30-я г. размалёўвалі ў розныя колеры. Палосамі фляндроўкі, што замяніла старадаўнюю акоўку, плоскасць куфра падзялялася на некалькі прамавугольнікаў, якія запаўняліся раслінными, геам. і зааморфнымі кампазіцыямі. Характар дэкору аналагічны інш. відам мясц. размалёўкі (гл. *Агоўская размалёўка*) ці аздабленню адзення, ручнікоў, дываноў. Традыцыйна існавала раздзяленне вытв. працэсаў: мужчыны выконвалі сталярныя і кавальскія работы, жанчыны — размалёўку. Промысел заняпаў у пач. 1960-х г., у 1970-я г. адроджаны (у 1978 у в. Агова створаны філіял Брэсцкай ф-кі сувеніраў). *Я.М.Сахута.*

**А́ГРА**... (ад грэч. agros поле), першая састаўная частка складаных слоў, якая па значэнні адпавядае слову «агранамічны», напр., *аграбіяцэноз*, *аграномія*.

**А́ГРА**, горад у Паўн. Індыі, у штаце Утар-Прадэш, порт на р. Джамна. 899 тыс. ж. (з прыгарадамі; 1991). Вузел чыгунак і аўтадарог. Цэнтр с.-г. раёна.

Агра. Агульны выгляд.

Гарбарна-абутковая, тэкст. (баваўняная), харч., папяровая, шкларобная, эл.-тэхн. прам-сць. Саматужныя промыслы (ручное ткацтва, разьба па камені).

У А. створаны выдатныя ўзоры магольскай архітэктуры Індыі: крэпасць Агра-форт (1564—70; чырв. пясчанік) з палацам Джаханґіры-Махал (1570), «Жамчужнай мячэццю» (1646—53; белы мармур), заламі Дывані-Ам (пачаты ў 1627) і Дывані-Кхас (1637); маўзалей *Тадж-Махал*; Саборная мячэць (1648); грабніца Ітымад-уд-Даула (1622—28; белы мармур з інкрустацыяй). За 9 км ад А. ў Сікандры маўзалей Акбара (1612—13); за 37 км унікальны помнік інд. горадабудаўніцтва Фатыхпур-Сікры (рэзідэнцыя Акбара, 1569—84). А. — цэнтр нар. разьбы і інкрустацыі па мармуры. Сучасная частка А. забудавана ў канцы 19 — пач. 20 ст. У А. ун-т (1927), Тадж-музеум з археал. калекцыямі, спец. б-ка прац Гандзі.

*Літ.*: Math K. Agra and its monumental glory. Bombay, 1977.

**АГРАБІЯЦЭНО́З**, аграцэноз (ад *агра...* + *біяцэноз*), біялагічнае згуртаванне пасяўных культур, пустазелля, жывёл і мікраарганізмаў, створанае ў выніку с.-г. дзейнасці чалавека. У адрозненне ад натуральнага *біяцэнозу* мае абмежаваны склад раслінных і жывёльных кампанентаў (у аснове культываваныя чалавекам расліны), слаба выяўленае самарэгуляванне, але большую біял. прадукцыйнасць. Комплексы інш. арганізмаў фарміруюцца ў выніку натуральнага адбору і рэгулявальнай дзейнасці чалавека. А. займаюць каля 10% усёй паверхні сушы.

**«АГРАБУ́Д»**, вытворча-праектна-тэхналагічны інстытут «Аграбуд» Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь. Засн. ў 1992 у Мінску на базе Бел. філіяла Усесаюзнага дзярж. праектна-тэхнал. ін-та «Аграбуд», арэндаднае прадпрыемства.

Асн. кірункі дзейнасці: канструктарскія, тэхн., пусканаладачныя і н.-д. работы; ўкараненне і аказанне дапамогі ва ўкараненні навук.-тэхн. дасягненняў; вытв-сць абсталявання, аснасткі, буд. вырабаў і матэрыялаў; утылізацыя і перапрацоўка прамысл. адходаў і другаснай сыравіны і інш.

**«АГРАБУДМЕХАНІЗА́ЦЫЯ»**, Дзяржаўны канструктарска-тэхналагічны інстытут «Аграбудмеханізацыя» Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь. Засн. ў 1986 у Мінску на базе праектна-канструктарскага бюро (з 1965), да 1992 — Усесаюзны канструктарска-тэхнал. ін-т буд. механізацыі.

Асн. кірункі дзейнасці: стварэнне сродкаў механізацыі буд.-мантажных работ, у т.л. па ліквідацыі выпікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС; распрацоўка бетонамяшальных установак і комплексаў, вагавых дазатараў вады, цэменту і напаўняльнікаў, тэхналогій і абсталявання для вытв-сці сценавых блокаў павышанай дакладнасці.

**АГРАГЛЕ́БАВЫ РАЁН**, таксанамічная адзінка глебава-геаграфічнага раянавання; састаўная частка *глебава-кліматычнай акругі* з пэўным комплексам прыродных і эканам. умоў. Вылучаецца паводле генетычна аднолькавага тыпу рэльефу, глебавага покрыва, мезаклімату, ступені забалочанасці, умоў для гасп. дзейнасці і інш. На тэр. Беларусі 20 А.р. Гл. карту пры арт. *Глебава-геаграфічнае раянаванне*.

**АГРАКЛІМАТАЛО́ГІЯ**, гл. ў арт. *Аграметэаралогія*.

**АГРАКЛІМАТЫ́ЧНАЕ РАЯНАВА́ННЕ**, падзел тэрыторыі па ступені спрыяльнасці кліматычных умоў для земляробства. Асн. задача А.р. — вылучэнне тэрыторый (паясоў, зон, абласцей, раёнаў і г.д.), што адрозніваюцца паміж сабой асаблівасцямі клімату і ўмовамі с.-г. вытв-сці. Падзяляецца на агульнае, якое дае магчымасць вызначыць у цэлым агракліматычныя рэсурсы для сельскай гаспадаркі, і спецыяльнае, што служыць для вырашэння канкрэтных вытв. задач. Ацэнка агракліматычных рэсурсаў праводзіцца пераважна праз паказчыкі колькасці цяпла і вільгаці, умоў перазімоўкі культур. У аснову А.р. ва ўмераных шыротах пакладзена сума т-р вышэй за 10 °С і працягласць залягання ўстойлівага снегавога покрыва. У найб. пашыранай схеме А.р. Беларусі (паводле А.Х.Шкляра) тэр. рэспублікі падзяляецца на 3 агракліматычныя вобласці з 6 падвобласцямі і 19 агракліматычнымі раёнамі (гл. схему). Раянаванне грунтуецца на аснове фіз.-геагр. правінцый, улічваюцца сумы т-р паветра за цёплы перыяд года (з т-рамі паветра вышэй за 10 °С), каэфіцыент увільгатнення, кантынентальнасць клімату, колькасць дзён з т-рамі паветра ад 5 да 15 °С і інш. паказчыкі.

*Літ.*: Грингоф И.Г., Попова В.В., Страшный В.Н. Агрометеорология. Л., 1987; Шкляр А.Х. Климатические ресурсы Белоруссии и использование их в сельском хозяйстве. Мн., 1973. *Т.С.Папова.*

**АГРАКЛІМАТЫ́ЧНЫЯ КА́РТЫ**. Адлюстроўваюць клімат як фактар с.-г. вытв-сці. Характарызуюць комплекс агракліматычных рэсурсаў пэўных тэрыторый, кліматычныя ўмовы развіцця асобных культур, асобныя віды клімат-




Вобласці: I Паўночная ўмерана цёплая вільготная, II Цэнтральная цёплая ўмерана вільготная, III Паўднёвая цёплая няўстойліва вільготная.

Падвобласці: А,Б,В,— Заходняя; Г, Д, Е,— Усходняя

Раёны: 1 Ашмянска–Мінска–Свянцянскі, 2 Нарачана–Вілейскі, 3 Ушацка–Лепельскі, 4 Полацкі, 5 Асвейска–Браслаўскі, 6 Гарадоцка–Віцебскі, 7 Суражска–Лучоскі, 8 Аршанскі, 9 Гродзенска–Іванцевіцкі, 10 Лідска–Івянецкі, 11 Навагрудскі, 12 Баранавіцка–Ганцавіцкі, 13 Барысаўска–Рудзенскі, 14 Бярэзінскі, 15 Горацка–Касцюковіцкі, 16 Пружана–Брэсцкі, 17 Пінскі, 18 Ныткавіцка–Мазырскі, 19 Гомельскі

тычных рэсурсаў сельскай гаспадаркі ў зручных паказчыках (напр., сумы актыўных т-р, працягласць вегетац. перыяду), кліматычныя з'явы, небяспечныя для сельскай гаспадаркі, тэрміны вегетацыі культур. Выкарыстоўваюцца для абгрунтавання агракліматычнага раянавання, рацыянальнага выкарыстання кліматычных рэсурсаў, планавання тэрмінаў с.-г. работ і вызначэння спецыялізацыі сельскай гаспадаркі.

**АГРАЛЕСАМЕЛІЯРА́ЦЫЯ** (ад *агра...* + *лес* + *меліярацыя*), тэорыя і практыка правядзення лесаводчых (у спалучэнні з агранамічнымі і інж.) мерапрыемстваў па прадухіленні неспрыяльнага для с.-г.

вытв-сці дзеяння прыродных фактараў. Асн. мэта А. — стварэнне ахоўных лесанасаджэнняў, якія прадухіляюць або памяншаюць эрозію глебы, замацоўваюць яры, схілы, пяскі, выконваюць ветраахоўную і снегазатрымальную функцыі, паляпшаюць мікраклімат, павышаюць вільготнасць глебы. У значных маштабах ахоўным лесаразвядзеннем займаюцца ў многіх краінах б. СССР і свету (ЗША, Данія, Вялікабрытанія, Германія, Францыя, Канада, Балгарыя, Венгрыя і інш.). На Беларусі яно ажыццяўляецца ў складзе мерапрыемстваў па *меліярацыі зямель*.

Навук. асновы А. ў Расіі закладзены працамі В.В.Дакучаева, А.І.Ваейкава, Г.М.Высоцкага ў канцы 19 ст. У распрацоўку агралесамеліярац. мерапрыемстваў вял. ўклад зрабілі рус. і бел. вучоныя-лесаводы Г.Ф.Марозаў, М.С.Несцераў, М.І.Сус, А.С.Казменка, А.Р.Мядзведзеў, І.К.Якушэнка, А.І.Саўчанка, В.К.Паджараў і інш.

Даследаванні на Беларусі пачаліся ў 1950-я г., вядуцца ў Ін-це лесу АН Беларусі, Бел. тэхнал. ун-це, н.-д. ін-тах глебазнаўства і агрохіміі, меліярацыі і лугаводства. Распрацаваны спосабы аблясення пяскоў, стварэння полеахоўных лясных палос на асушаных тарфяніках, лясных палос на схілах, разараных пясках і супесках, аблясення яроў, агратэхн. прыёмаў барацьбы з эрозіяй.

*Літ.*: Агролесомелиорация. 3 изд. М., 1966; Орловский В.Б., Поджаров В.К., Воробьёв В.Н. Защитное лесоразведение в Белоруссии: (Справ. пособие). Мн., 1980.

**АГРАМА́ДЖВАННЕ ВЫТВО́РЧАСЦІ**, зліццё раздробненых вытв. працэсаў у розных галінах эканомікі ва ўсё больш паглыблены вытв. грамадскі працэс. Абумоўлена *грамадскім падзелам працы*, выкарыстаннем сродкаў вытв-сці, якія патрабуюць калектыўнай дзейнасці, вядзе да канцэнтрацыі і цэнтралізацыі капіталу, паглыблення *спецыялізацыі вытворчасці, кааперавання вытворчасці*, міжнар. *інтэграцыі эканамічнай*.

Аналізуючы працэс аграмаджвання вытв-сці і працы, К.Маркс зрабіў выснову аб асн. супярэчнасці капіталізму — паміж грамадскім характарам працы і прыватнай формай прысваення яе вынікаў. Гэта супярэчнасць, на яго думку, з'яўляецца рухаючай сілай развіцця капіталізму.

**АГРАМЕТЭАРАЛАГІ́ЧНАЯ СТА́НЦЫЯ**. Вядзе сістэматычныя назіранні за надвор'ем, даследуе развіццё асн. с.-г. культур, стан глебы і інш. па спец. праграмах. Асн. задача — забеспячэнне сельскай гаспадаркі *аграметэаралагічнымі прагнозамі* і звесткамі. Вывучаюцца аграгідралагічныя ўласцівасці і водны баланс глебы, мікракліматычныя асаблівасці палёў і фактары, якія ўплываюць на ўраджайнасць с.-г. культур; вядуцца *феналагічныя назіранні* і інш. На Беларусі А.с. ў Васілевічах (Рэчыцкі р-н), Ваўкавыску, Горках, Самахвалавічах (Мінскі р-н), Шаркоўшчыне (1995).

**АГРАМЕТЭАРАЛАГІ́ЧНЫ ПРАГНО́З**. Высвятляе ступень спрыяльнасці будучага надвор'я для развіцця с.-г. культур, правядзення с.-г. работ, выкарыстання пэўнай агратэхнікі. Заснаваны на ўліку біял. асаблівасцяў раслін і выніках метэаралаг. назіранняў. На Беларусі з 1938 складаюцца доўгатэрміновыя А.п. пераразмоўкі азімых (на плошчах рознага стану), запасаў вільгаці ў глебе на вясну, аптымальных тэрмінаў сяўбы азімых і яравых збожжавых культур, пасадкі бульбы, тэрмінаў выспявання с.-г. культур і іх ураджайнасці.

**АГРАМЕТЭАРАЛО́ГІЯ** (ад *агра...* + *метэаралогія*), сельскагаспадарчая метэаралогія, навука, якая вывучае метэаралагічныя, кліматычныя і гідралагічныя ўмовы, што маюць значэнне для сельскай гаспадаркі. Амаль не адмежавана ад агракліматалогіі (вывучае клімат як фактар с.-г. вытв-сці). Задачы А.: вывучэнне заканамернасцяў фарміравання метэаралагічных і кліматычных умоў с.-г. вытв-сці, мікраклімату палёў; распрацоўка метадаў колькаснай ацэнкі ўплыву метэаралаг. фактараў на рост і фарміраванне ўраджаю, на развіццё шкоднікаў і хвароб с.-г. культур; абгрунтаванне эфектыўных мер па пераадоленні неспрыяльных і небяспечных для сельскай гаспадаркі гідраметэаралагічных з'яў; агракліматычнае абгрунтаванне прыёмаў меліярацыі; распрацоўка метадаў *аграметэаралагічных прагнозаў*; с.-г. ацэнка кліматычных рэсурсаў тэрыторыі і інш. На Беларусі рэгулярныя аграметэаралагічныя назіранні праводзяцца з 1921; у 1995 — на 48 метэастанцыях, у т.л. на 5 *аграметэаралагічных станцыях*. На аснове шматгадовых назіранняў падрыхтаваны агракліматычныя даведнікі (выд. 1958, 1970, 1985).



Віды і формы брыльянтавай агранкі з колькасцю граняў 56 (1, 6–8), 100 (2), 72 (3, 5) і 240 (4).

**АГРАНАМІ́ЧНЫЯ РУ́ДЫ**, мінералы і горныя пароды, якія з'яўляюцца сыравінай для вытв-сці мінер. угнаенняў. Да іх належаць апатыты, фасфарыты, калійныя солі, салетра, сера, карбанатныя пароды (даламіт, мел, вапняк), сапрапелі, вермікуліт, торф і інш. На выраб мікраўгнаенняў выкарыстоўваюць руды, у якіх ёсць медзь, бор, марганец і інш. Найбуйнейшыя радовішчы А.р. на Беларусі: паклады калійных соляў (Салігорскі і Петрыкаўскі р-ны), даламітаў (Віцебскі р-н), фасфарытаў (усх. раёны Магілёўскай вобл.). У значных аб'ёмах здабываюцца вапнавыя матэрыялы і торф.

**АГРА́НКА**, 1) наданне ювелірнаму каменю шліфаваннем ці паліраваннем геаметрычна правільнай ці асіметрычнай формы мнагагранніка для ўзмацнення яго бляску і зіхацення. 2) Спалучэнне розных па форме і памерах граняў, нанесеных на паверхню каменю. Тыпы А.: ружай (ад 12 да 72 граняў), паўбрыльянтавая (ад 12 да 32), брыльянтавая (ад 48 да 240 і болей), ступеньчатая, клінамі, мяшаная, кабашонам (гладкае шліфаванне). Класічны від брыльянтавай А. — 56 граняў. 3) Сукупнасць граняў прыроднага хрусталю — натуральная А. мінералу.

**АГРАНО́МІЯ** (ад *агра...* + грэч. nomos закон), комплекс навук. і практычных прыёмаў па вырошчванні с.-г. культур. Асн. раздзелы сучаснай А.: *земляробства, раслінаводства, насенняводства, агрохімія, селекцыя, фітапаталогія* і інш.

Ад зараджэння земляробства развівалася як галіна практычнай дзейнасці і вопыту чалавека. Навук. асновы ў Еўропе закладзены ў 17—18 ст., на Беларусі — у 1840-я г. ў Горы-Горацкай земляробчай школе. У сярэдзіне 19 ст. А. становіцца комплекснай навукай, з яе вылучаюцца агрохімія і с.-г. мікрабіялогія, пазней — глебазнаўства. Развіццё А. ў многім абавязана франц. вучонаму Ж. Бусенго — заснавальніку першай у Зах. Еўропе доследнай станцыі ў Эльзасе (1857). Значная роля ў станаўленні і развіцці А. належыць А.Ц. Болатаву, І.М.Комаву, А.Тэеру, Ю.Лібіху, В.В.Да-

кучаеву, В.Р.Вільямсу, К.А.Ціміразеву, Дз.М.Пранішнікаву, І.У.Мічурыну, М.І.Вавілаву, бел. вучоным А.В.Саветаву (упершыню ў сусв. практыцы звязаў развіццё сістэм земляробства з сац.-эканам. ўмовамі, даў класіфікацыю сістэм земляробства і іх гісторыю), І.А.Сцебуту, М.В.Рытаву, В.С.Ластоўскаму. Істотны ўклад у развіццё агранамічных ведаў зрабілі працы амер. селекцыянера Л.Бёрбанка па стварэнні новых формаў пладовых, дэкар. і інш. с.-г. раслін. У Зах. Еўропе і ЗША паспяхова развівалася ў 20 ст. хімізацыя земляробства, селекцыя і насенняводства с.-г. культур.

Шырокія агранамічныя даследаванні на Беларусі пачаліся, калі былі створаны с.-г. н.-д. ін-ты і доследныя станцыі (1920-я г.). Праблемы А. распрацоўваюцца ў НДІ (земляробства і кармоў, глебазнаўства і аграхімії, аховы раслін, бульбаводства, пладаводства, агародніцтва, меліярацыі і лугаводства), Ін-це праблем выкарыстання прыродных ресурсаў і экалогіі АН Беларусі, Акадэміі агр. навук, Бел. аграрным тэхнічным ун-це, а таксама ў с.-г. ВНУ, на абл. і галіновых с.-г. доследных станцыях. Дастасавальна да ўмоў рэспублікі бел. вучонымі (Я.К.Аляксееў, А.К.Кедраў-Зіхман, І.С.Лупіновіч, Ц.М.Годнеў, В.І.Шэмпель, В.Ф.Купрэвіч, П.П.Рагавой, М.А.Дарожкін, С.Г.Скарапанаў, П.І.Альсмік, М.Дз.Мухін, Т.Н.Кулакоўская і інш.) рэкамендаваны мерапрыемствы па павышэнні ўраджайнасці с.-г. культур, навукова абгрунтаваныя севазвароты, спосабы рацыянальнага выкарыстання ўгнаенняў і апрацоўкі глебы. Складзены глебавыя карты гаспадарак, картаграмы кіслотнасці і забяспечанасці глебаў фосфарам і каліем. Прызнанне за межамі рэспублікі атрымалі многія высокаўраджайныя, устойлівыя да хвароб сарты с.-г. раслін бел. селекцыі. Пасля Чарнобыльскай катастрофы актуальнасць набыло вывучэнне наяўнасці і міграцыі радыенуклідаў у глебах, тэхналогій і спосабаў вядзення с.-г. вытворчасці на забруджаных радыенуклідамі глебах.

*Літ.*: Повышение плодородия почв и производительной способности земель в интенсивных системах земледелия. Мн., 1981. С. 3—11; Антонов Е.А. Становление и современное состояние научно-агрономического знания. Харьков, 1992.

**АГРАНУЛАЦЫТО́З**, алейкія, рэзкае памяншэнне колькасці або амаль поўнае знікненне з крыві *гранулацытаў*. А. можа быць сімптомам прамянёвай хваробы, лейкозу, малярыі, брушнога тыфу, віруснага гепатыту, грыпу і інш., а таксама самаст. хваробай (вострыя А.), А. міэлатаксічныя ўзнікае пры парушэнні ўтварэння гранулацытаў у касцявым мозгу, А. імунныя назіраецца пры разбурэнні гранулацытаў крыві. Можа сведчыць пра парушэнне функцыі крывятворнай, імуннай і інш. сістэм арганізма.

**АГРАНУЛАЦЫ́ТЫ** [ад *а...* + лац. granulum зярнятка + ... *цыт(ы)*], незярністыя лейкацыты, лейкацыты, у цытаплазме якіх адсутнічае зярністасць — *лімфацыты* і манацыты ў пазваночных жывёл і чалавека і падобных да іх, амёбацыты ў беспазваночных. Выконваюць ахоўную функцыю.

**АГРАПРАМЫСЛО́ВАЯ ІНТЭГРА́ЦЫЯ**, форма арганізацыі вытв.-эканам. сувязяў сельскай гаспадаркі з інш. галінамі матэрыяльнай вытв-сці, якія яе абслугоўваюць. З'яўляецца спецыфічнай формай тэр.-вытв. міжгалінавага кааперавання прадпрыемстваў розных галін з адасобленымі, але арганічна звязанымі паміж сабой тэхнал. працэсамі. А.і. забяспечвае ўмацаванне *кааперацыі працы* і вытв-сці, завершанасць тэхнал. цыкла, павышэнне якасці і канкурэнтаздольнасці прадукцыі.

Дыферэнцыруецца на вертыкальную і гарызантальную. Вертыкальная А.і. — міжгалінавае кааперыраванне прадпрыемстваў і вытв-сцяў розных галін нар. гаспадаркі, якое забяспечвае аптымальнае праходжанне тавараў масы ў адзіным тэхнал. працэсе з адной фазы ў другую (вытворчасць — перапрацоўка — рэалізацыя). Уключае прадпрыемствы сельскай гаспадаркі, па перапрацоўцы с.-г. сыравіны і вытв-сці прадуктаў харчавання, па захаванні і збыту прадукцыі, а таксама нарыхтоўчыя і транспартныя. У АПК вылучаюць шэраг інтэгравальных блокаў: мясны (прадпрыемствы па дагадоўванні і адкорме буйн. раг. жывёлы, свіней і авечак; птушкафабрыкі па вытв-сці бройлераў, мясакамбінаты, каладзільнікі, гандаль; буракацукровы (бураканасенняводчыя, буракасеючыя гаспадаркі, цукровыя і рафінадныя з-ды) і інш. Гарызантальная А.і. — унутрыгалінавае кааперыраванне прадпрыемстваў і вытв-сцяў адной ці некалькіх падгалін, якое забяспечвае паглыбленне спецыялізацыі асобных звенняў адзінага тэхнал. працэсу (напр., вытв.-эканам. сувязі ў малочнай і мясной жывёлагадоўлі на аснове пастадыйнай спецыялізацыі, інтэграцыя насенняводчых, рэпрадукцыйных гаспадарак і прадпрыемстваў па вытв-сці таварнага зерня і г.д.). Гарызантальная інтэграцыя развіваецца на аснове доўгатэрміновых устойлівых вытв.-эканам. сувязей на рынкупах куплі-продажу, а таксама праз стварэнне сумесных і змешаных прадпрыемстваў.

*М.А.Бычкоў, У.Р.Гусакоў.*

**АГРАПРАМЫСЛО́ВЫ КО́МПЛЕКС** (АПК), сукупнасць галін нар. гаспадаркі, якія забяспечваюць вытв-сць прадуктаў харчавання і прамысл. вырабаў з с.-г. сыравіны, а таксама рэалізацыю іх спажыўцам. Уключае: галіны, якія забяспечваюць АПК сродкамі вытв-сці (харч. прам-сць, трактарнае і с.-г. машынабудаванне, рамонт тэхнікі, вытв-сць мінер. угнаенняў і хім. сродкаў аховы раслін, здабычу торфу для сельскай гаспадаркі, мікрабіялагічную прам-сць і капітальнае буд-ва); *сельскую гаспадарку* (у т.л. *асабістую дапаможную гаспадарку* насельніцтва) і *лясную гаспадарку*; галіны, што даводзяць с.-г. прадукцыю да спажыўца (нарыхтоўка, перапрацоўка, захаванне, транспарціроўка, рэалізацыя). У агрпрамысловай вытв-сці вылучаюць: вытв-сць сродкаў вытв-сці для ўсёй сістэмы АПК; с.-г. вытв-сць; вытв-сць прадуктаў харчавання і прамысл. вырабаў з с.-г. сыравіны; рэалізацыю канчатковай прадукцыі; вытв.-тэхн. і тэхнал. абслугоўванне ўсіх стадый аднаўленчага цыкла. Да АПК адносяць таксама с.-г. навуку і сістэму падрыхтоўкі кадраў для ўсіх сфераў. На долю галін, якія ўваходзяць у АПК Рэспублікі Беларусь, прыпадае больш за 40% валавога грамадскага прадукту, каля 45% асн. вытв. фондаў і 36% колькасці працоўных усёй нар. гаспадаркі (1992). Асноўнае звяно АПК — сельская гаспадарка, у якой сканцэнтравана больш за 70% асн. вытв. фондаў АПК, каля 70% працаўнікоў і вырабляецца больш за 45% валавой прадукцыі (1992).

*М.А.Бычкоў, У.Р.Гусакоў.*

**АГРА́РНАЕ ПРА́ВА**, спецыялізаваная комплексная галіна права, нормы якога замацоўваюць асн. прынцыпы арг-цыі і дзейнасці с.-г. прадпрыемстваў і аб'яднанняў, рэгулююць іх узаемаадносіны паміж сабой і дзяржавай, з работнікамі сельскай гаспадаркі і грамадзянамі, якія вядуць індывід. сялянскую (фермерскую) гаспадарку. Прававымі ін-тамі А. п. з'яўляюцца: аграрныя праваадносіны, прававое рэгуляванне пераходу да рынкавых адносін у агрпрамысл. комплексе, дзярж. рэгуляванне сельскай гаспадаркі, прававое становішча суб'ектаў гаспадарання, арганізацыйна-прававыя формы іх кіраўніцтва, права ўласнасці на зямлю і сродкі вытв-сці, рэгуляванне працоўных адносін, аплата працы і размеркаванне прыбыткаў і інш. Асн. крыніцы А.п. на Беларусі — Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб зямлі, законы аб праве ўласнасці на зямлю, аб плацяжах за зямлю, аб сялянскай (фермерскай) гаспадарцы і інш.

*М.В.Сторажаў.*

**АГРА́РНАЕ ПЫТА́ННЕ**, комплекс сац.-эканам. праблем агр. сектара, абумоўленых формай уласнасці на зямлю і характарам агр. палітыкі дзяржавы. Ахоплівае *землеўладанне* і *землекарыстанне*, *аграрныя адносіны*, *аграрныя рэформы*, *аграрныя крызісы*, вырашэнне сац. запатрабаванняў *сялянства*. А.п. — адно з карэнных у развіцці грамадства, таму што зямля — асн. сродак вытв-сці, с.-г. дзейнасцю займаецца большая частка насельніцтва зямнога шара, ад эфектыўнасці агр. сектара залежыць стан харч. праблемы і сыравіннай базы прамысловасці.

А.п. ўзнікла ў выніку грамадскага падзелу працы, развіцця тавараабмену і паглыблення сац. няроўнасці, якая прывяла да узурпацыі зямельнай уласнасці. У эпоху феадалізму зямля канцэнтравалася пераважна ва ўладаннях феадалаў (князёў, баяр, шляхты, баронаў, памешчыкаў і інш.), якія ў розных формах спаганялі з прыгонных сялян *зямельную рэнту*. Капіталіст. ўклад у сельскай гаспадарцы фарміраваўся двума шляхамі: т.зв. «прускім» (праз эвалюцыю феад.-памешчыцкіх гаспадарак) і «амерыканскім» (развіццё *фермерства*). Першы шлях найб. характэрны для Германіі, другі — для ЗША; у Рас. імперыі спалучаліся абодва тыпы. У Англіі зямлю ў сялян адбіралі і перадавалі лендлордам. Ва ўсіх выпадках нараджэнне сельскай буржуазіі было вынікам канцэнтрацыі ў яе ўласнасці большай часткі

зямельных уголддзяў пры абеззямельванні сялян. Хоць феад. пережыткі ў некаторых краінах доўга захоўваліся, развіццё капіталізму спрыяла пераадоленню застою ў сельскай гаспадарцы, укараненню новай тэхнікі, павышэнню прадукцыйнасці працы ў с.-г. вытв-сці. Асабліва хутка гэты працэс адбываўся ў развітых краінах, дзе пасля 2-й сусв. вайны пачалі ажыццяўляць дзярж. рэгуляванне агр. сектара, накіраванае на ўзмацненне буйных гаспадарак за кошт дробных, каб найб. эфектыўна выкарыстасць дасягненні навук.-тэхн. прагрэсу. Такая палітыка з сярэдзіны 1950-х г. пашырылася ў краінах Зах. Еўропы і атрымала назву «зялёных планаў». Так, у ФРГ за 1949—70 ліквідавана 756 тыс. (амаль 49%) гаспадарак памерам да 10 га, у ЗША за 1940—64 колькасць фермерскіх гаспадарак зменшылася на 2,9 млн. (амаль удвая). Вытворчасцю с.-г. прадукцыі пачалі займацца і буйныя прамысл. карпарацыі. З ростам тэхн. аснашчанасці агр. сектара змяншаецца колькасць сельскага насельніцтва. У развітых краінах Зах. Еўропы яго ўдзельная вага знізілася з 36% у 1937 да 23% у 1965. У 1965—68 у агр. сектары было занята ў ЗША 9%, Канадзе 11, Францыі 16% насельніцтва. Асабліва зменшылася колькасць сямейных і наёмных рабочых. Але пры гэтым істотна выросла эфектыўнасць с.-г. вытв-сці. Пасля 2-й сусв. вайны прадукцыйнасць працы ў сельскай гаспадарцы ЗША (у рэчыўным выражэнні) расце ўдвая хутчэй, чым у інш. сектарах эканомікі. Калі ў 1950 адзін работнік, заняты ў с.-г. вытв-сці, мог забяспечыць харчаваннем 15 чал., то ў 1968 — 43, у 1987 — 96 чалавек. У выніку моцнай дзярж. падтрымкі агр. сектара развітыя краіны маюць дастаткова харч. прадуктаў і на свае патрэбы і на экспарт; у агр. сектары створана сучасная інфраструктура, забяспечаны высокі ўзровень жыцця. Але і ў гэтых краінах існуюць свае праблемы ў А.п.

На Беларусі з адменай прыгону (1861) для развіцця капіталізму ў сельскай гаспадарцы былі больш спрыяльныя ўмовы, чым у інш. рэгіёнах Расіі. У выніку паўстання 1863—64 царскі ўрад вымушаны быў ажыццявіць тут шэраг мерапрыемстваў, якія аблягчалі вызваленне сялян ад прыгоннай залежнасці. Шырокая сетка чыгунак садзейнічала больш шырокаму збыту с.-г. прадукцыі на ўнутр. і замежных рынках. Але і тут да Кастр. рэвалюцыі 1917 захавалася шмат буйных латыфундый (больш за 10 тыс. дзес. кожная): у 1877 іх было 116, у 1905 — 119. З агульнай зямельнай пл. 16 595 тыс. дзес. у 1877 на прыватнаўласніцкія гаспадаркі прыпадала 55,4%, у 1905 — 57%; на надзельныя адпаведна 33,4% і 33,2%. У 1877, паводле звестак надзельнага землекарыстання, 61,9% сял. двароў мелі да 15 дзес., 27,6% — па 15—16 дзес. і 10,5% — больш за 20 дзес. кожны. У 1917 на кожную з 576,2 тыс. сял. гаспадарак прыпадала ў сярэднім па 8,9 дзес. зямлі. Развіццё капіталізму ў вёсцы абумоўлівала рост тэхн. аснашчанасці, таварнасць с.-г. вытв-сці; с.-г. прадукцыя Беларусі актыўна пранікала на рас. і сусв. рынкі. Але развіццё капіталіст. адносін стрымліваўся феад. пережыткамі. Прыкладна $^2/_3$ даходу сяляне аддавалі на грашовыя падаткі і натуральныя павіннасці. Таму яны выступалі за «амерыканскі» шлях развіцця капіталізму, у той час як памешчыкі і царскія ўлады імкнуліся накіраваць гэты працэс па «прускім» шляху.

Да А.п. і шляхоў яго вырашэння парознаму ставіліся паліт. партыі і арг-цыі. Правыя бурж. партыі (акцябрысты, мірнаабнаўленцы і інш.) падтрымлівалі *Сталыпінскую аграрную рэформу*, дапускалі адчужэнне зямлі ў памешчыкаў толькі ў выключных выпадках за выкуп. Кадэты, Канстытуцыйна-каталіцкая партыя Літвы і Беларусі і блізкія да іх арг-цыі стаялі за дадатковае надзяленне сялян зямлёй за кошт прымусовага адчужэння часткі памешчыцкіх зямель за выкуп. Эсэры, трудавікі, Бел. сацыяліст. грамада, Польская сацыяліст. партыя прадугледжвалі канфіскацыю памешчыцкай зямлі без выкупу і размеркаванне яе паміж сялянамі. Агр. праграма бальшавікоў прадугледжвала рэв. вырашэнне А.п. праз нацыяналізацыю зямлі. Пасля Кастр. рэвалюцыі 1917 зямля была нацыяналізавана. З канфіскацыяй і размеркаваннем памешчыцкіх, царкоўных і казённых зямель сял. землекарыстанне ў БССР да 1923 павялічылася на 1042 тыс. дзес., а сярэдні зямельны памер сял. гаспадарак, якія атрымалі зямлю, вырас на 3—4 дзес. У выніку каля чвэрці бядняцкіх гаспадарак па плошчы землекарыстання перайшлі ў групу серадняцкіх. У час *новай эканамічнай палітыкі* ў 1920-я г. праводзіліся аб'яднанне дробных зямельных участкаў, выхад на *хутары*, пасёлкі і *водрубы*, дадатковае надзяленне малазямельных з дзярж. фонду і за кошт «лішкаў» зямлі, адрэзаных у кулакоў. На хутарах і адрубах у 1928 гаспадарыла 24% сялян. Мерапрыемствы па землеўпарадкаванні і хутарызацыі спрыялі павышэнню культуры земляробства, прадукцыйнасці працы. Да 1925 сельская гаспадарка БССР дасягнула даваен. ўзроўню. У 1927 у агульнай колькасці сял. гаспадарак больш за 50% было серадняцкіх, 47 бядняцкіх і 2,5% кулацкіх. У 2-й пал. 1920-х г. на прынцыпах добраахвотнасці і асабістай зацікаўленасці ў вёсцы паскорана развівалася *кааперацыя*, якая ў 1929 ахоплівала 69% сялян. Так праз апору на сял. дробнатаварную вытв-сць сав. ўлада зрабіла важныя захады ў вырашэнні А.п. Але яно зноў абвастрылася ў сувязі з *калектывізацыяй*, якая ажыццяўлялася пераважна прымусова. Кулакі і частка заможных сераднякоў (самыя вопытныя гаспадары) былі раскулачаны і сасланы. Зямлю ў сялян адабралі, аддалі калгасам і саўгасам, а сельскім жыхарам пакінулі невял. зямельныя надзелы для *асабістай дапаможнай гаспадаркі*. Дзяржава дапамагала калектыўным гаспадаркам тэхнікай, насеннем, спецыялістамі, але адначасова ажыццяўляла жорсткае адміністраванне, пазбаўляючы сялян самастойнасці ў вядзенні гаспадаркі, груба парушаючы прынцыпы матэрыяльнай зацікаўленасці. Таму разлік на істотнае павышэнне прадукцыйнасці працы ў калектыўных гаспадарках не апраўдаўся: у 1932—39 ураджайнасць збожжавых складала 5,2—6,7 ц/га (пры 7 ц/га у 1913), а бульбы 61—87 ц/га. Зменшылася пагалоўе і прадукцыйнасць жывёлы.

У Зах. Беларусі, якая ў 1921—39 уваходзіла ў склад Польшчы, напачатку панавала буйнапамешчыцкае землеўладанне пры малазямелі і збядненні большай часткі сялян, захаванні феад. пережыткаў. Агр. рэформа 1920 мела бурж. характар, не вырашыла А.п. на карысць сялян. Пасля ўз'яднання Зах. Беларусі з БССР (1939) малазямельныя сяляне і парабкі без выкупу атрымалі 430 982 га з б. памешчыцкіх і часткова з казённых зямель і становішча іх палепшылася. Але і пасля гэтага большасць сял. гаспадарак заставаліся маламоцнымі (зямельны надзел больш як 340 тыс. гаспадарак не перавышаў 5 га). Калектывізацыя тут праводзілася больш павольна: да 1941 было арганізавана 1115 калгасаў, якія аб'ядналі 6,7% сял. гаспадарак і 7,8% зямлі.

У Вял. Айч. вайну ням.-фаш. акупанты ператваралі калгасы і саўгасы ў т.зв. абшчынныя гаспадаркі або на іх аснове стваралі свае дзярж. гаспадаркі з прымусовай прыгонніцкай працай. Пасля вызвалення Беларусі ад акупантаў калгасы і саўгасы былі адноўлены, у зах. абласцях БССР пачалася прымусовая калектывізацыі. У 2-й пал. 1950-х г. сельская гаспадарка Беларусі дасягнула даваен. ўзроўню, а істотны рост с.-г. вытв-сці, паляпшэнне становішча сялян пачаліся ў 1960—70-я г. У 1987 атрыманы найбольшы за ўсю гісторыю Беларусі валавы збор збожжа (7,8 млн. т). У вёсцы ў вял. аб'ёмах вялося жыллёвае і культ.-быт. буд-ва. Калгаснікі атрымлівалі гарантаваную грашовую плату. Істотна павысіўся ўзровень механізацыі с.-г. вытв-сці, на жывёлагадоўчых комплексах вытв-сць прадукцыі пастаўлена на прамысл. аснову. Паглыблялася спецыялізацыя с.-г. вытв-сці і аграпрамысл. інтэграцыя.

Аднак эфектыўнасць агр. сектара Беларусі, як і ў цэлым СССР, істотна адставала ад развітых краін, а сац. развіццё вёскі — ад горада. Адна з гал. прычын у тым, што ва ўмовах адм.-камандней сістэмы селянін не мог распараджацца ні сродкамі вытв-сці, ні вынікамі сваёй працы. Дзяржава не толькі не аказала агр. сектару дастатковай фін. падтрымкі, а, наадварот, за яго кошт вырашала многія сац.-эканам. праблемы грамадства. У пераходны да рыначнай эканомікі перыяд у сельскай гаспадарцы Беларусі паглыбіліся крызісныя з'явы. Для выйсця з крызісу ажыццяўляецца новая агр. рэформа, сутнасць якой у ліквідацыі манапольнага права калгасаў і саўгасаў на карыстанне зямлёй, у развіцці ў агр. сектары розных формаў гаспадарання пры поўнай іх самастойнасці як суб'ектаў рыначнай эканомікі.

*Літ.*: Липинский Л.П. Развитие ка-

питализма в сельском хозяйстве Белоруссии (II половина XIX в.). Мн., 1971; Панютич В.П. Социально-экономическое развитие белорусской деревни в 1861—1900 гг. Мн., 1990; Шабуня К.И. Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии в революции 1905—1907 гг. Мн., 1962; Афанасенка И.Д., Давыденко Л.Н. Новый способ производства продовольствия. М., 1992; Ленін У.І. Зямельнае пытанне ў Расіі // Тв. Т. 20 (Полн. собр. соч. Т. 25); Кэмпбел Р. Макконнелл, Стэнли Л. Брю Экономикс: принципы, проблемы и политика: Пер. с англ. Т. 2. М., 1992.

*Л.М.Давыдзенка, У.А.Салановіч.*

**АГРА́РНАЯ ПАЛІ́ТЫКА**, стратэгія і тактыка дзяржавы ў адносінах да *сялянства*, да вырашэння праблем агр. сектара. Вызначальная састаўная частка *аграрнага пытання*.

**АГРА́РНАЯ ПА́РТЫЯ** (АП), палітычная партыя на Беларусі. Утворана ў 1992 як Аб'яднаная аграрна-дэмакр. партыя Беларусі, на II з'ездзе (28.1.1994) перайменавана ў АП. Выступае за рэфармаванне грамадства на прынцыпах дэмакр. сацыялізму, перабудову эканомікі на аснове прыватнай і дзярж. уласнасці на сродкі вытв-сці, у т.л. і на зямлю. У сельскай гаспадарцы прызнае формы: вытв. кааператыў, акц. т-ва, калгас і саўгас, сялянская гаспадарка і малое прадпрыемства.

*А.А.Дзмітрук.*

**АГРА́РНЫ КРЫ́ЗІС**, эканамічны крызіс перавытворчасці ў сельскай гаспадарцы. Абумоўлены характарам *аграрных адносін*: узнікае не ад празмернасці і непатрэбнасці атрыманага аб'ёму с.-г. прадукцыі, а з-за асаблівасцяў умоў яе вытв-сці і размеркавання.

Карыстанне зямлёй, асабліва ва ўмовах прыватнага землеўладання, абумоўлівае *зямельную рэнту*, якая ўплывае на ўзровень цэн на зямлю, арэнднай платы і г.д. Асваенне новых урадлівых зямель, тэхн. аснашчанасць агр. сектара, паляпшэнне транспартных зносін і інш. змены ва ўмовах вытв-сці і рэалізацыі с.-г. прадукцыі вядуць да змяншэння цаны на с.-г. прадукцыю. У выніку адбываецца канфлікт паміж новай цаной і старымі рэнтавымі адносінамі: знікае крыніца (дадатковы прыбытак) для выплаты рэнты. Гэта і выклікае А.к., які характарызуецца ростам нерэалізаваных запасаў с.-г. прадукцыі, змяншэннем аб'ёму яе вытв-сці, паскарэннем працэсу дробных і сярэдніх вытворцаў, ростам беспрацоўя і зніжэннем аплаты працы работнікаў агр. сектара.

А.к. мае пераважна зацяжны характар. Так, А.к., які пачаўся адначасова з прамысловым у 1873 і ахапіў Зах. Еўропу, Расію, а потым і ЗША, працягваўся да сярэдзіны 1890-х г. Ён найб. закрануў краіны Еўропы, на рынкі якіх пайшлі патокі таннага збожжа з ЗША, Канады, Аўстраліі і інш. краін. На гэты час вытв-сць збожжа павялічылася і ў Расіі. У 5 зах. губернях (Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай) сяроднегадавы збор збожжа ў 1871—80 у параўнанні з 1851—60 вырас на 62%. Беларусь стала адным з важнейшых рэгіёнаў Рас. імперыі па вытв-сці таварнага збожжа. Аднак у 1886—88 гандаль ім на Беларусі зусім разладзіўся. Скараціўся і вываз збожжа: прыкладна з 10,8 млн. пудоў у 1875—80 да 7,5 млн. пудоў у 1880-я г. А ў 1890-я г. Беларусь стала рэгіёнам завозу збожжа: пастаўлялася прыкладна 9,2 млн. пудоў (вываз 7,5 млн. пудоў). Нізкія цэны на збожжа, змяншэнне попыту на яго ў час А.к. абумовілі перабудову сельскай гаспадаркі Беларусі — пачала хутка развівацца малочная жывёлагадоўля, пашырыўся выраб розных гатункаў малочных прадуктаў, павялічылася вытв-сць лёну, паскорылася развіццё вінакурэння. Гэтая прадукцыя пастаўлялася на рас. і замежныя рынкі. Больш хутка ўкаранялася с.-г. тэхніка. Адбыліся змены і ў землеўладанні.

А.к., што ўзнік у пач. 1-й сусв. вайны, быў пераадолены толькі ў час 2-й сусв. вайны. Перапляценне яго з прамысл. крызісам 1929—33 выклікала небывалае зніжэнне цэн на с.-г. прадукцыю (у ЗША за 1929—32 на 58%). Каб змякчыць вынікі А.к., знішчаліся запасы таварнага збожжа, каўчукавыя, кававыя і чайныя плантацыі, змяншалася пагалоўе жывёлы і г.д. Урад ЗША выплачваў вял. грашовыя сродкі фермерам, каб яны скарачалі пасяўныя плошчы пад асн. с.-г. культуры. Пасля 2-й сусв. вайны ў ЗША, Канадзе, Аўстраліі і інш. краінах пачаўся новы А.к. У выніку ў ЗША з 1948 зноў пачало дзейнічаць заканадаўства аб скарачэнні пасяўных плошчаў. У розных формах ён выяўляецца і ў краінах Зах. Еўропы. Каб не дапусціць А.к. ці зменшыць яго адмоўныя вынікі, у развітых капіталіст. краінах ажыццяўляецца дзярж. рэгуляванне агр. сектара — устанаўленне цвёрдых цэн на с.-г. прадукцыю, вызначэнне аб'ёмаў яе вытв-сці, экспарту і імпарту пры моцнай фін. падтрымцы фермераў і тэхн. перааснашчэнні с.-г. вытв-сці.

*Л.М.Давыдзенка, У.А.Салановіч.*

**АГРА́РНЫЯ АДНО́СІНЫ**, вытворчыя адносіны ў сельскай гаспадарцы, абумоўленыя характарам уласнасці на зямлю. Гэта адносіны паміж класамі і сац. групамі на аснове пэўных формаў *землеўладання* і *землекарыстання*, а таксама паміж дзяржавай і землекарыстальнікамі (с.-г. прадпрыемствамі, фермерамі і інш.) у сувязі з умовамі арганізацыі вытв-сці, рэалізацыі прадукцыі і размеркавання атрыманага даходу.

Сутнасць А.а. пры феадалізме вызначала поўная ўласнасць феадала на зямлю і няпоўная на прыгонных сялян, з якіх спаганялася высокая адработачная, натуральная ці грашовая *зямельная рэнта*. Пры гэтым сяляне заставаліся ў надзвычай цяжкіх умовах. Такія адносіны спараджалі антаганізм, сял. паўстанні, якія часам перарасталі ў сял. войны з мэтай пераўтварэння сістэмы землеўладання на больш справядлівай аснове. Пры капіталізме характар А.а. абумоўлены захаваннем прыватнай уласнасці на зямлю. Селянін, атрымаўшы свабоду ад прыгону, фактычна заставаўся залежны ад землеўладальніка. Таму выкарыстанне наёмнай працы ў сельскай гаспадарцы спалучалася з феад. рэнтавымі адносінамі.

Пасля 2-й сусв. вайны А.а. ў развітых капіталіст. краінах характарызуюцца дзярж. рэгуляваннем у агр. сектары. На аснове т.зв. *«зялёных планаў»* дзяржава аказвае цвёрдую матэр.-фін. падтрымку буйному землеўладанню, што вядзе да масавага разарэння дробных гаспадарак. Адначасова з узнікненнем буйных фермерскіх гаспадарак з'явіліся вял. землеўладанні карпарацый, якія каля 40% сваіх зямель здаюць у арэнду фермерам і прысвойваюць частку дзярж. субсідый. Тым не менш у гэтых краінах створаны спрыяльныя ўмовы для выкарыстання дасягненняў навук.-тэхн. прагрэсу ў сельскай гаспадарцы, забеспячэння яе высокай эфектыўнасці і вырашэння харч. праблемы ў краіне.

На Беларусі, як і ва ўсёй Расійскай імперыі, асноўнай супярэчнасцю ў А.а. была наяўнасць буйнога землеўладання, з аднаго боку, і мноства малазямельных сялян і парабкаў — з другога. Сялянскі рух разгортваўся фактычна за ўсталяванне «амерыканскага» шляху развіцця капіталізму ў сельскай гаспадарцы — ліквідацыю памешчыцкага землеўладання і феад. пережыткаў, у той час як царскія ўлады падтрымлівалі «прускі» шлях, ажыццяўляючы *сталыпінскую аграрную рэформу*.

Агр. праграма бальшавікоў прадугледжвала ліквідацыю прыватнай уласнасці на зямлю, перадачу зямлі сялянству і знішчэнне на гэтай аснове антаганізму ў А.а. У перыяд грамадз. вайны і ваен. інтэрвенцыі Сав. дзяржава, падтрымліваючы бядняцкія і серадняцкія слаі сялянства, вымушана праводзіла палітыку *харчразвёрсткі*, заменены в 1921 на *харчпадатак*. Пасля нацыяналізацыі зямлі, у выніку ліквідацыі памешчыцкага і абмежавання кулацкага землеўладання, зямельныя надзелы бядняцкіх і серадняцкіх гаспадарак былі істотна павялічаны. На гэтым этапе характар А.а. вызначаўся фарміраваннем і развіццём сял. дробнатаварнай вытв-сці. Аднак з ажыццяўленнем *калектывізацыі* А.а. прынцыпова змяніліся: заможныя гаспадары былі раскулачаны і сасланы, зямля перададзена калгасам і саўгасам. Сяляне, адчужаныя ад сродкаў вытв-сці і вынікаў сваёй працы, фактычна ператварыліся ў наёмных рабочых. Калектыўнымі гаспадаркамі кіравала дзяржава, якая хоць і дапамагала ім у матэрыяльна-тэхн. забеспячэнні, але пры гэтым значную частку іх даходаў накіроўвала на вырашэнне інш. сац.-эканам. праблем грамадства.

З пач. 1990-х г. у Рэспубліцы Беларусь заканадаўча дазволена *арэнда зямлі*, стварэнне *фермерскіх гаспадарак*, рэарганізацыя калгасаў, саўгасаў і інш. Сутнасць гэтых змен у тым, каб ператварыць сялян у паўнаўладных гаспадароў зямлі, стварыць у агр. сектары самастойных суб'ектаў рыначнай эканомікі. Для фарміравання стабільных, жыццядзейных А.а. вырашаюцца таксама праблемы парытэту цэн на с.-г. і прамысл. прадукцыю, залучэнне замежных

інвестыцый у агр. сектар, падатковых ільгот, субсідый і інш. формаў падтрымкі сельскай гаспадаркі, асабліва развіцця яе сац. сферы.

*Л.М.Давыдзенка, У.А.Салановіч.*

**АГРА́РНЫЯ РЭФО́РМЫ**, пераўтварэнні сістэм *землеўладання* і *землекарыстання*. Абумоўлены патрэбамі эканам. і сац. развіцця грамадства, сял. рухам за зямлю. Пераважна маюць антыфеад. характар, паколькі ў асноўным накіраваны на ліквідацыю феад. пережыткаў у агр. сектары.

А.р., праведзеныя ў шэрагу краін Зах. Еўропы ў перыяд бурж. рэвалюцый 17—19 ст., нанеслі сур'ёзны ўдар па феад. адносінах і расчысцілі шлях капіталіст. развіццю ў сельскай гаспадарцы (Вялікабрытанія, Францыя). Шырокі размах А.р. набылі пасля 2-й сусв. вайны ў краінах Азіі і Лац. Амерыкі; іх мэта — ліквідацыя феад., патрыярхальна-радавых адносін і каланіяльнай зямельнай уласнасці. У краінах сацыяліст. арыентацыі А.р. ажыццяўляліся рознымі метадамі, але прадугледжвалі ліквідацыю памешчыцкага землеўладання і пэўныя абмежаванні прыватнага землекарыстання. У развітых капіталіст. краінах А.р. былі накіраваны на стварэнне буйной с.-г. вытв-сці на базе дасягненняў навукова-тэхн. прагрэсу.

На Беларусі адна з першых А.р. — *валочная памера*, праведзеная ў сярэдзіне 16 — 1-й пал. 17 ст. ў ВКЛ у сувязі з развіццём фальварковай гаспадаркі, вызначыла прынцыпы землекарыстання ўсяго бел. сялянства. Паводле *Тызенгаўза рэформы 1765* дзярж. сяляне каралеўскіх эканомій пераведзены з аброчнай павіннасці на паншчынную пры адначасовым рэгуляванні іх зямельных надзелаў. У 1830—50-я г. царскі ўрад ажыццявіў *дзяржаўнай вёскі рэформу*, у выніку якой у дзярж. маёнтках зах. губерняў ліквідаваны фальваркі, зямля раздадзена сялянам, а паншчына заменена аброкам. Інвентарная рэформа 1840—50-х гадоў вызначыла памер сял. зямельнага фонду ў прыватнаўласніцкіх маёнтках. Паводле *сялянскай рэформы 1861* сяляне вызвалены ад прыгону і надзелены зямлёй. Гэта буйнейшая А.р. азначала пераход Расіі, у т.л. Беларусі, ад феадалізму да капіталізму, хоць і пасля гэтага феад. пережыткі яшчэ доўга захоўваліся. На дзярж. землях Беларусі, Літвы і Правабярэжнай Украіны праведзена *дзяржаўных сялян рэформа 1867*, паводле якой сяляне пераводзіліся на выкуп і далучаліся да разраду сялян-уласнікаў. У канцы 19 — пач. 20 ст. на Беларусі і ў Літве царскі ўрад праводзіў землеўпарадкаванне вольных людзей, якія павінны былі выкупіць арандаваныя землі або адмовіцца ад карыстання імі. Аналагічны характар мела *чыншавая рэформа 1886*, паводле якой арандатарам-чыншавікам Беларусі, Правабярэжнай Украіны і Літвы неабходна было пацвердзіць свае правы на карыстанне зямлёй і выкупіць яе, інакш з гэтай зямлі іх зганялі. З мэтай стымулявання агр. капіталізму ў ліст. 1906 — чэрв. 1917 ажыццяўлялася *сталыпінская аграрная рэформа*. У Зах. Беларусі зямельная рэформа 1925 прадугледжвала выкуп за поўны кошт часткі дзярж. і памешчыцкіх зямель, садзейнічала паскарэнню хутарызацыі, насаджэнню на «крэсах усходніх» польскіх вайск. і цывільных каланістаў — *асаднікаў*. Пасля Кастр. рэвалюцыі 1917 зямля ў Расіі, у т.л. на Беларусі, была нацыяналізавана і перададзена бядняцкім і серадняцкім гаспадаркам. Але ў час *калектывізацыі* яе ў сялян адабралі і перадалі ў калектыўнае карыстанне калгасам і саўгасам. Пасля распаду СССР у постсацыяліст. краінах з пач. 1990-х г. ажыццяўляюцца новыя А.р. Сутнасць іх у краінах Балтыі і Усх. Еўропы — ва ўмацаванні прыватнага землеўладання, у Расіі, Беларусі і інш. б. сав. рэспубліках — у стварэнні шматукладнай эканомікі ў агр. сектары (*арэнда зямлі*, рэарганізацыя калгасаў і саўгасаў у акц. т-вы, аграфірмы, кааператывы, стварэнне *фермерскіх гаспадарак* і інш.).

*Л.М.Давыдзенка, У.А.Салановіч.*

**АГРАТЭ́ХНІКА** (ад *агра...* + *тэхніка*), сістэма прыёмаў вырошчвання с.-г. раслін, тэхналогія *раслінаводства*. Уключае *апрацоўку глебы*, унясенне ўгнаенняў, падрыхтоўку насення, сяўбу і пасадку, догляд пасеваў, барацьбу з пустазеллем, шкоднікамі і хваробамі с.-г. раслін, уборку ўраджаю і інш. мерапрыемствы (усе працэсы ўзаемаабумоўлены і складаюць агратэхн. комплекс).

Прыёмы А., звязаныя з выкарыстаннем сістэмы с.-г. машын і заснаваныя на дасягненнях аграбіял. навук, пачалі складацца ў канцы 18 — пач. 19 ст. Задача сучаснай А. — забеспячэнне высокіх ураджаяў пры мінім. затратах працы і сродкаў на адзінку высакаякаснай прадукцыі, захаванне ўрадлівасці глебы і ахова яе ад эрозіі (гл. *Эрозія глебы*). Выбар прыёмаў А. абумоўліваецца спецыялізацыяй гаспадаркі, глебава-кліматычнымі ўмовамі, біял. асаблівасцямі культур і ажыццяўляецца ў сістэме *севазваротаў*.

На Беларусі, размешчанай у зоне дастатковага ўвільгатнення і бедных дзярнова-падзолістых глебаў, асн. мэта А. — абагачэнне глебы пажыўнымі рэчывамі, паляпшэнне яе фіз.-хім. уласцівасцяў, рэгуляванне воднага рэжыму (гл. *Акультурванне глебы, Вапнаванне глебы, Меліярацыя*). З мэтай найлепшага выкарыстання ўгнаенняў створана агрохім. служба і на ўсе гаспадаркі складзены агрохім. картаграмы. Распрацоўку тэарэт. асноў і практычных метадаў А. ўзначальваюць н.-д. ін-ты Мін-ва сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь.

*Літ.:* Панников В.Д., Минеев В.Г. Почва, климат, удобрение и урожай. 2 изд. М., 1987; Моргун Ф.Т., Шикула Н.К., Тарарико А.Г. Почвозащитное земледелие. 2 изд. Киев, 1988; Механизация обработки почвы и посева при интенсивных технологиях возделывания сельскохозяйственных культур. Горки, 1993.

**АГРАФІ́ЗІКА** (ад *агра...* + *фізіка*), агранамічная фізіка, навука пра фіз. працэсы ў глебе і раслінах, выкарыстанне метадаў і сродкаў рэгулявання фіз. умоў жыцця с.-г. культур для павышэння іх прадукцыйнасці. Сфарміравалася ў пач. 20 ст. Станаўленне А. звязана з імёнамі Э.Расела, А.Ф.Іофе, Дз.М.Пранішнікава, М.А.Качынскага і інш. Развіваецца на аснове *аграномії* і фізікі. Уключае: фізіку глебы і прыземнага слоя паветра, святлокультуру раслін, спосабы і сродкі рэгулявання вонкавых умоў жыцця раслін. На Беларусі праблемы А. вывучаюцца ў н.-д. ін-тах глебазнаўства і агрохіміі, меліярацыі і лугаводства, Бел. тэхнал. ун-це, Ін-це эксперым. батанікі АН Беларусі. Даследуюцца водна-фіз. і цеплавыя ўласцівасці, водна-паветраны рэжым, водны і цеплавы балансы глебаў, вільгацезабяспечанасць с.-г. і лясных культур, змена фактараў урадлівасці глебы пад уплывам меліярацыі і інтэнсіўнага земляробства, спосабы аптымізацыі фіз. умоў вырошчвання с.-г. культур, уздзеянне ўмоў навакольнага асяроддзя на працэс фотасінтэзу (С.Г.Скарапанаў, В.Ф.Шабека, К.П.Лундзін, Р.І.Афанасік, Л.П.Смаляк, У.Л.Калер, М.І.Афанасьеў). Вынікі даследаванняў з'яўляюцца тэарэт. асновай гідратэхн. меліярацыі і апрацоўкі глебаў, павышэння прадукцыйнасці раслін, выкарыстоўваюцца ў агратэхніцы.

*Літ.:* Растворова О.Г. Физика почв. Л., 1983; Агрофизические свойства почв и их регулирование в условиях интенсивного земледелия. Саранск, 1989. *М.І.Афанасьеў.*

**АГРАХІ́МІЯ** (ад *агра...* + *хімія*), агранамічная хімія, навука пра хім. працэсы ў глебе і раслінах, жыўленне раслін, выкарыстанне ўгнаенняў і сродкаў хім. меліярацыі глебаў; аснова *хімізацыі сельскай гаспадаркі*. Грунтуецца на дасягненнях *аграномії* і хіміі.

Пачала фарміравацца ў 2-й пал. 18 — пач. 19 ст. Адзін з заснавальнікаў А. франц. вучоны Ж.Бусенго. Развіццё ў Расіі звязана з працамі М.І.Афоніна, А.Ц.Болатава, А.А.Нартава, М.Г.Паўлава і інш., у замежжы — шведскага хіміка І.Валерыуса, ням. Ю.Лібіха і А.Тэера. У галіне А. працавалі Дз.І.Мендзялееў (першыя доследы па вывучэнні эфектыўнасці ўгнаенняў), К.А.Цімірязеў, П.А.Костычаў, Дз.М.Пранішнікаў (заснавальнік агрохім. школы; распрацаваў тэорыю азотнага жыўлення раслін, навук. асновы фасфарытавання глеб) і інш. Вынікі агрохім. даследаванняў выкарыстоўваюцца пры распрацоўцы пытанняў аховы земляў, ажыццяўленні папераджальных мер барацьбы з забруджваннем глебы.

На Беларусі першыя агрохім. даследаванні праведзены ў Горы-Горацкай земляробчай школе (вывучэнне эфектыўнасці гною), на Беняконскай с.-г. (выкарыстанне лубіну на зялёнае ўгнаенне) і Мінскай балотнай (дзеянне ўгнаенняў на тарфяных глебах) доследных станцыях. Як самаст. навука развіваецца з 1920-х г.: распрацоўка асноў вапнавання глебаў і вывучэнне дзеяння ўгнаенняў на розных глебах і культурах (А.К.Кедраў-Зіхман, Р.І.Пратасеня, І.Р.Уласенка, І.К.Шпілеўскі, В.І.Шэмпель, В.С.Рубанаў, У.М.Пілько, Р.Т.Вільдфлуш, З.П.Ганчарова, Б.Б.Бельскі), распрацоўка рацыяналь-

ных спосабаў выкарыстання сідэратаў (Я.К.Аляксееў) і торфу як угнаення. Н.-д. работа па праблемах А. вядзецца ў Бел. НДІ глебазнаўства і аграхіміі, які стаў метадычным цэнтрам па кіраўніцтве Дзярж. аграхім. службай і геагр. сеткай доследаў з угнаеннямі, а таксама ў н.-д. ін-тах земляробства і кармоў, меліярацыі і лугаводства, пладаводства, агародніцтва, бульбы, Бел. с.-г. акадэміі, Гродзенскім с.-г. ін-це, аддзелах аграхіміі абл. доследных станцый. Распрацаваны тэарэт. асновы і спосабы выкарыстання ўгнаенняў пад запланаваны ўраджай з улікам уласцівасцяў глебаў і біял. асаблівасцяў культур. Вывучаецца А. глебаў і жыўлення раслін з дапамогай мечаных атамаў (С.Н.Іваноў). Складаюцца дэталёвыя планы выкарыстання ўгнаенняў для палёў і культур кожнай гаспадаркі рэспублікі, размяркоўваюцца фонды мінер. угнаенняў і вапны, робяцца прагнозы ўраджайнасці с.-г. культур, разлікі планавай і фактычнай акупнасці ўгнаенняў (Т.Н.Кулакоўская, І.М.Багдзевіч, Л.П.Дзяткоўская, Р.У.Васілюк). З 1980-х г. роля А. ў рашэнні праблем сельскай гаспадаркі нязмерна вырасла. Інтэнсіўныя тэхналогіі вырошчвання с.-г. культур у многім базіруюцца на рацыянальным выкарыстанні ўгнаенняў і інш. хім. сродкаў, што патрабуе распрацоўкі аптымальных рэжымаў жыўлення раслін, новых формаў угнаенняў і спосабаў іх прымянення.

*Літ.:* Новое в повышении плодородия почв. Мн., 1988; Агрохимическая характеристика почв сельскохозяйственных угодий Республики Беларусь. Ч. 1—2. Мн., 1992.

*П.І.Шкурынаў.*

**АГРАЦЭНО́З**, тое, што *аграбіяцэноз*.

**АГРАЭКАЛО́ГІЯ** (ад *агра...* + *экалогія*), сельскагаспадарчая экалогія, раздзел прыкладной экалогіі, які вывучае ўплыў фактараў асяроддзя (біятычных і абіятычных) на прадукцыйнасць культурных раслін, а таксама структуру і дынаміку згуртаванняў арганізмаў, што насяляюць с.-г. ўгоддзі, уплыў *аграбіяцэнозаў* на жыццяздольнасць раслін, якія культывуюцца. Асновы сучаснай А. распрацавалі вучоныя італьян. Дж.Ацы (1956) і ням. В.Тышлер (1965). Гал. задача А. — размяшчэнне і выкарыстанне с.-г. угоддзяў і прыродных экасістэм (участкі лясоў, лугоў, балот, помнікі прыроды, заказнікі і інш.) такім чынам, каб забяспечыць максімальную біял. прадукцыйнасць ландшафтаў і іх захоўванне. Пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС адной з цэнтр. праблем А. на Беларусі стала вывучэнне міграцыі радыенуклідаў у экасістэмах, у прыватнасці ў аграбіяцэнозах.

**АГРАЭНЕ́РГА**, Навукова-даследчы інстытут энергетыкі і электрыфікацыі аграпрамысловага комплексу Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання і Акадэміі аграрных навук Рэспублікі Беларусь. Засн. ў 1993 у Мінску на базе Усесаюзнага н.-д. і тэхнал. ін-та мантажу, эксплуатацыі і рамонту машын і абсталявання жывёлагадоўчых і птушкагадоўчых фермаў. Асн. кірункі дзейнасці: распрацоўка навук. асноў перспектыўнага развіцця энергетыкі і электрыфікацыі аграпрамысл. комплексаў (АПК), рац. энергазабеспячэння, спосабаў эфектыўнага выкарыстання розных відаў энергіі, сістэм машын і абсталявання для паліўнаэнергет. комплексу, камплектаў халадзільнага абсталявання, сродкаў аўтаматызацыі для кіравання тэхнал. працэсамі, энергазберагальных, эколагабяспечных тэхналогій для галін АПК.

*У.Г.Бабіцкі.*

**АГРЫ́ЗКА** Іасафат Пятровіч (1826, Лепельскі р-н Віцебскай вобл. — 30.3.1890), выдавец, журналіст, удзельнік рэв.-вызв. руху 1860-х г. Скончыў Мінскую гімназію, Пецярбургскі ун-т са ступенню кандыдата права (1849). Працаваў у Мін-ве фінансаў. У Пецярбургу заснаваў друкарню, выдаваў газ. «Słowo» («Слова», 1859, на польск. мове, забаронена ўрадам), перавыдаў зб. стараж. законаў Польшчы, Беларусі, Літвы, Украіны *Валюміна легум* і інш. З студэнцкіх гадоў прымыкаў да гуртка З.Серакоўскага, падтрымліваў сувязі з М.Г.Чарнышэўскім, з рэв. т-вам «Зямля і воля». У 1863 гал. прадстаўнік варшаўскага паўстанцкага ўрада ў Пецярбургу. 14.11.1864 арыштаваны і прыгавораны да 20 гадоў катаргі.

**АГРЫ́КАЛА** (Agricola) Георг [сапр. Бауэр (Bauer); 24.3.1494, г. Глаўхаў, Германія — 21.11.1555], нямецкі вучоны ў галіне горнай справы і мінералогіі. Д-р медыцыны. На аснове даследаванняў прац антычных вучоных па геалогіі і горнай справе, уласных назіранняў абагульніў і сістэматызаваў вопыт горна-металург. вытв-сці. Навукова абгрунтаваў асновы пошуку і разведкі радовішчаў карысных выкапняў, падземнай распрацоўкі рудаў і іх абагачэння, металургіі, прабірнага майстэрства. Апісаў 20 новых мінералаў, прапанаваў метады вызначэння іх па вонкавых прыкметах. Вывучаў лекавыя ўласцівасці металаў і мінералаў.

**АГРЫ́КАЛА** (Agricola) Мікаэль (сапр. Сіманс; каля 1508—10, г. Перная, Фінляндыя — 9.4.1557), пачынальнік Рэфармацыі ў Фінляндыі, роданачальнік фінскай л-ры і літ. мовы. У 1536—39 вучыўся ў Вітэнбергскім ун-це ў ням. дзеячаў Рэфармацыі Лютэра і Меланхтана. Першы пратэстанцкі лютэранскі епіскап у Фінляндыі (з 1554 епархія Аба). Выдаў першы буквар фін. мовы (1542), пераклады на фін. мову малітоўнікаў, Новага Запавету (1548), часткі Старога Запавету (1551—52) з вершаванымі прадмовамі, нарысамі па гісторыі, культуры, язычніцкіх вераваннях Фінляндыі, календаром і аграномічнымі звесткамі.

**АГРЫ́ПА** Марк Віпсаній (Marcus Vipsanius Agrippa; каля 63, Далмацыя — 12 да н.э.), рымскі палкаводзец і паліт. дзеяч, паплечнік *Аўгуста*. Консул у 37, 28 і 27. Атрымаў перамогі каля Перузіі ў 40 да н.э., у марскіх бітвах каля Мілаў у 36 над Секстам Пампеем, каля мыса Акцый 2.9.31 над Клеапатрай і Антоніем. Фінансаваў буд-ва ў Рыме Пантэона, водаправода, тэрмаў і інш. Пад яго кіраўніцтвам праведзена геад. здымка ўсёй Рым. імперыі, на аснове якой складзена карта свету.

**АГРЭГА́Т** (ад лац. aggregatus далучаны), 1) у петраграфіі сукупнасць мінер. зерняў ці іх зросткаў, якія ўтвараюць горныя пароды, руды, друзы і інш. Бывае просты — з аднаго мінералу (напр., мармур, кварцыт) і складаны — з некалькіх мінералаў (напр., граніт, сіеніт). Адрозніваюць А. цэментаваныя, рыхлыя, зямлістыя, порыстыя, шчыльныя і інш. 2) Машынны А. — узбуйнены уніфікаваны (нармалізаваны) элемент (вузел) машыны, які адрозніваецца поўнай узаемазамяняльнасцю і самастойна выконвае пэўныя функцыі (напр., электрарухавік, помпа). Машыннымі А. часам наз. фрэзерныя станкі-аўтаматы, транспарцёры і інш. 3) Сукупнасць дзвюх і болей машын ці апаратаў, якія працуюць сумесна, у адным комплексе (напр., ворны А. складаецца з трактара, плугоў і барон; дызель-генератар — з дызельнага рухавіка і электрагенератара; турбакампрэсар — з турбіны і кампрэсара).

**АГРЭГА́ТНАЯ УНІФІКАВА́НАЯ СІСТЭ́МА** (АУС), тэхнічная сістэма са стандартнымі блокамі кіравання вытворчымі працэсамі. Уваходныя і выхадныя параметры блокаў уніфікаваныя, таму ў схемах аўтаматыкі яны могуць выкарыстоўвацца ў розных спалучэннях і колькасцях. Гэта дазваляе збіраць розныя па прызначэнні сістэмы аўтам. кіравання і кантролю.

У залежнасці ад віду энергіі для перадачы сігналаў АУС падзяляюцца на электрычныя, пнеўматычныя, гідраўлічныя і камбінаваныя. Найб. пашыраны пнеўматычныя, у якія ўваходзяць блокі вымярэння, рэгулявання, сумматары, задатчыкі, функцыянальныя пераўтваральнікі, узмацняльнікі, блокі для выканання лагічных аперацый, сігнальныя прыстасаванні, прыборы кантролю, выканаўчыя механізмы і інш. АУС выкарыстоўваюцца пры аўтаматызацыі вытв-сці ў розных галінах прам-сці.

**АГРЭГА́ТНЫ СТАНО́К**, металарэзны станок, які складаецца ў асн. з уніфікаваных (нармалізаваных), кінематычна не звязаных паміж сабой вузлоў (*агрэгатаў*). Узаемазалежнасць і паслядоўнасць руху агрэгатаў надаецца звычайна адзінай сістэмай кіравання. Адрозніваюць А.с. адна - і многапазіцыйныя (па колькасці дэталяў, што адначасова апрацоўваюцца); свідравальныя, расто-

чныя, фрэзерныя, такарныя і камбінаваныя; паўаўтаматы і аўтаматы.

Асн. рабочыя органы А.с.: сілавыя галоўкі з індывід. прыводамі перамяшчэння і вярчэння інструментаў; сілавыя і паваротныя сталы, якія перамяшчаюць адпаведна сілавыя галоўкі або загатоўкі паміж пазіцыямі апрацоўкі. А.с. забяспечваюць многаінструмент. апрацоўку загатовак адначасова з некалькіх бакоў, іх можна хутка перакампаноўваць для апрацоўкі інш. дэталяў; дазваляюць шматразова выкарыстоўваць часткі агрэгатаў пры замене аб'екта апрацоўкі. У серыйнай і буйнасерыйнай вытв-сці з іх ствараюцца паточныя і *аўтаматычныя лініі*.

**АГРЭГА́ТНЫЯ СТА́НЫ РЭ́ЧЫВА**, якасна розныя станы аднаго і таго ж рэчыва, якія адрозніваюцца характарам цеплавога руху часціц (атамаў, малекул). Адрозніваюць 3 А.с.р.: *газ, вадкасць, цвёрдае цела* (чацвёртым А.с.р. часта наз. *плазму*). Рэчыва ў любым агрэгатным стане існуе пры пэўных умовах (т-ра, ціск), змены якіх вядуць да скачкападобнага пераходу з аднаго стану ў другі. Такая змена А.с.р. наз. *фазавым пераходам* першага роду.

**АГРЭГА́ЦЫЯ** ў біялогіі, працэс збірання (зліпання) клетак у шматклетачнае ўтварэнне — агрэгат, заснаваны на *адгезіі*. Адбываецца пры нармальным развіцці арганізмаў і ў эксперыменце пасля штучнага раз'яднання клетак, напр., пратэалітычнымі ферментамі і рэчывамі, якія звязваюць іоны кальцыю. Пры А. клеткі «сартуюцца»: аднатыпныя зліпаюцца, разнатыпныя застаюцца раз'яднаныя. Здольнасць клетак да А. залежыць ад т-ры і іоннага складу асяроддзя, з'яўлення на паверхні клетак спецыфічных бялковых рэчываў, якія садзейнічаюць іх зліпанню.

**АГРЭЖЭ́** (франц. agrege літар. прыняты ў таварыства), вучоная ступень, уведзеная ў Францыі з 1808. Прысуджаецца выпускнікам ун-та пасля здачы спец. конкурсных экзаменаў. Дае права выкладаць у ліцэях, на прыродазнаўчанавук. і гуманітарных ф-тах ун-таў. Дыплом А. прыкладна эквівалентны дыплому, што атрымліваюць выпускнікі ун-таў СНД.

**АГРЭМА́Н** (франц. agrement), папярэдняя згода ўрада адной краіны на прызначэнне пэўнай асобы ў якасці кіраўніка дыпламат. прадстаўніцтва другой краіны. Паводле Венскай канвенцыі аб дыпламат. зносінах 1961 без А. такое прызначэнне не можа адбыцца. Пасля атрымання А. асоба становіцца персонай грата. Прычыны адмовы ў А. тлумачыць не абавязкова.

**АГРЭ́НЕЎ-СЛАВЯ́НСКІ** (сапр. Агрэнеў) Дзмітрый Аляксандравіч (19.12.1836, або 1834, Масква — 23.7.1908), рускі спявак (тэнар), харавы дырыжор. Арганізатар і кіраўнік хору «Славянская капэла» (1868), з якім канцэртаваў па Расіі і за мяжой. У праграмах былі і бел. нар. песні («Чаму ж мне не пець», «Ці не дудка мая» і інш.). Адыграў значную ролю ў прапагандзе слав. муз. фальклору, хоць маст. якасці некат. яго запісаў і апрацовак, адбор нар. песень крытыкаваліся знаўцамі музыкі.

*Літ.:* Локшин Д.Л. Замечательные русские хоры и их дирижёры. 2 изд. М., 1963.

**АГРЭСІ́НЫ**, прадукты жыццядзейнасці хваробатворных мікробаў. Узмацняюць іх патагеннае дзеянне. Аслабляюць абаронныя рэакцыі арганізма, іх проціінфекц. імунітэт, забяспечваюць пранікненне патагенных мікробаў у арганізм, іх размнажэнне і распаўсюджванне. Па хім. прыродзе — бялкі, поліцукрыды.

**АГРЭСІЎНАСЦЬ ВАДЫ́**, здольнасць вады разбураць металы, бетон і інш. матэрыялы ў выніку ўздзеяння растворанымі ў ёй солямі або газамі. Асабліва высокая ў вады, якая мае солі амонію, саляную, серную і інш. кіслоты. Павышанай агрэсіўнасцю валодаюць нечышчаныя сцёкавыя воды, воды, забруджаныя змытымі з палёў хім. ўгнаеннямі, атмасферная вільгаць, насычаная злучэннямі азоту, серы і інш. кіслотаўтваральных элементаў (*«кіслотныя дажджы»*). Высокаагрэсіўныя воды неспрыяльныя і нават згубныя для існавання многіх арганізмаў.

**АГРЭ́СІЯ** (ад лац. aggressio нападзенне), выкарыстанне ўзброенай сілы адной дзяржавай (групай дзяржаў) супраць суверэнітэту, тэр. цэласнасці, паліт. незалежнасці другой дзяржавы або народа (нацыі). Найб. небяспечная ўзброеная (прамая) форма А. Існуе таксама паняцце ўскоснай А., пры якой дзяржава-агрэсар скрыта выкарыстоўвае ўзбр. сілы (напр., праз узбр. банды наёмнікаў, нерэгулярных вайск. фарміраванняў). Паводле Статута ААН, Савет Бяспекі можа кваліфікаваць як А. і інш. дзеянні. Адпаведна з міжнар. правам А. — злачынства супраць міжнар. міру і таму цягне за сабой міжнар. адказнасць. Дзяржава, якая стала аб'ектам А., мае права на прыняцце мер індывідуальнай і калектыўнай абароны. Савет Бяспекі ААН правамоцны прыняць рашэнне аб выкарыстанні да агрэсара мер, у т.л. ваеннага характару (напр., у 1991 узбр. сілы НАТО выступілі супраць Ірака, які захапіў Кувейт).

*Л.В.Паўлава.*



Прыклады кампановак **агрэгатных станкоў**: 1 — вертыкальны аднабаковы аднапазіцыйны; 2 — нахілены аднабаковы аднапазіцыйны; 3 — шматбаковы аднапазіцыйны змешанай кампаноўкі; 4 — вертыкальны аднабаковы шматпазіцыйны.



Уніфікаваныя агрэгаты вертыкальнага **агрэгатнага станка**: 1 — станіна; 2 — цэнтральны і наладачны пульты; 3 — паваротны дзялільны стол; 4 — гідрабак; 5 — помпавая ўстаноўка; 6 — гідрапанэль; 7 — электрашафа станка; 8 — сілавы стол (у станках іншых тыпаў — сілавыя галоўкі); 9 — стойка; 10 — свідравальная бабка; 11 — упорны вугольнік; 12 — расточная панэль; 13 — разьбовы капір; 14 — шпіндэльная каробка; 15 — падаўжальнік; 16 — электрашафа сілавых механізмаў; 17 — каробка скарасцей; 18 — двухпазіцыйны дзялільны стол; 19 — расточная бабка; 20 — бакавая станіна. У станку уніфікаваны базавыя дэталі (1, 9, 11, 20), шпіндэльныя механізмы (10, 14, 19) і інш.

Агрэст адхілены.

**АГРЭ́СТ** (Crossularia), род кустовых раслін сям. агрэставых. Больш за 50 відаў, пашыраных у Паўн. Амерыцы, Еўропе, Азіі і Паўн. Афрыцы. На Беларусі культывуецца А. адхілены (G. reclinata). Каля 10 відаў інтрадукаваны Цэнтр. бат. садам АН Беларусі як ягадныя і дэкар. расліны.

А. адхілены вядомы з 11 ст. Родапачынальнік большасці культурных сартоў. Выш. кустоў 60—120 см. Цвіце ў 1-й пал. мая.

Плады — несапраўдныя ягады, голыя або апушаныя, белыя, жоўтыя, зялёныя, чырвоныя, пурпурныя. Маюць цукру 5—12%, арган. к-т 1—2%, пекцінавыя рэчывы, вітамін С, карацін. Пладаносіць пачынае на 3-і год. Размнажаецца насеннем, чаранкамі, атожылкамі. Лепш расце на дастаткова вільготных угноеных сугліністых глебах. Ураджайнасць 10—15 т/га. Сарты, пашыраныя на Беларусі: Яравы, Куршу дзінтарс, Беларускі, Малахіт, Шчодры. Ягады спажываюцца свежыя і перапрацаваныя (джэм, варэнне, мармелад, сок). А. мае радыепратэктарныя ўласцівасці (садзейнічае вывядзенню з арганізма радыенуклідаў). Выкарыстоўваецца ў нар. медыцыне. Асн. шкоднікі: пільшчыкі, агрэставы пядзенік; хваробы: сфератэка, іржа, антракноз, септарыёз.

*Літ.:* Бурмистров А.Д. Ягодные культуры. 2 изд. Л., 1985; Сергеева К.Д. Крыжовник. М., 1989.

**АГУАСКАЛЬЕ́НТЭС** (Aguascalientes), горад у Цэнтр. Мексіцы. Адм. ц. штата Агуаскальентэс. Размяшчаецца на плато на выш. каля 2 тыс. м над узр. м. Засн. ў 1575. 506 тыс. ж. (1990). Чыг. вузел. Шарсцяная, баваўняная, харч. (мукамольная, плодаканцервавая і інш.), тытунёвая, вінаробчая, нафтаперапр. прам-сць. Вытв-сць керамікі. Ун-т. Арх. помнікі 18 ст. Каля А. бальнеалагічны курорт.

**АГУ́ДА** (1068—1123), заснавальнік і першы імператар [1115—23] дзяржавы *Цзінь* у Кітаі. Завяршыў аб'яднанне чжурчжэняў, распачатае яго бацькам Янкэ, у 1114 узняў паўстанне супраць панавання кіданьскай імперыі *Ляо* і заняў крэпасці *кіданяў* на б.ч. Маньчжурыі. У 1115 абвясціў сябе імператарам пад імем Мінь і назваў дынастыю Цзінь («Залатая»). У 1116 захапіў усю Маньчжурыю, да 1123 — тэр. Ляо ў Паўн. Кітаі.

**АГУ́ЛЬНАЕ**, усеагульнае, філасофская катэгорыя, якая адлюстроўвае агульнасць уласцівасцяў і адносін адзінкавых рэчаў, з'яў, працэсаў матэрыяльнага і духоўнага свету. А. не існуе само па сабе, у «чыстым» выглядзе. Яно непарыўна звязана з *адзінкавым* і *асаблівым*. Характарызуючы прыроду агульных паняццяў, філосафы-«наміналісты» сцвярджалі, што рэальна існуюць толькі адзінкавыя прадметы, агульнае ж прадстаўлена толькі ў словах ці паняццях. «Рэалісты», наадварот, меркавалі, што А. (паняцці, сутнасці, універсаліі) у такой жа ступені, а можа, і больш рэальныя, чым адзінкавыя прадметы. Абсалютызацыя А., агульных ісцін вядзе да *дагматызму*, які ігнаруе спецыфіку асобнага, індывід., асаблівага. У навук. пазнанні такі падыход не садзейнічае новым адкрыццям і прагрэсу ў цэлым.

*А.А.Лазарэвіч.*

**АГУ́ЛЬНАЕ МОВАЗНА́ЎСТВА**, агульная лінгвістыка, галіна *мовазнаўства*, якая вывучае універсальныя ўласцівасці і заканамернасці мовы як найважнейшага сродку зносін паміж людзьмі, а таксама агульныя рысы ўсіх моў або іх груп у плане будовы (структуры), функцыянавання і развіцця. Сярод гал. праблем А.м. — сац. сутнасць, знакавасць, развіццё мовы, мова і мысленне, мова і грамадства, мова і паэт. творчасць; тыпалогія моў паводле іх будовы і асаблівасцяў функцыянавання, метады даследавання мовы. Паводле асаблівасцяў прадмета і метадаў даследавання вылучаюць: агульную фанетыку, лексікалогію, граматыку, стылістыку; лінгвістычную паэтыку; *сацыялінгвістыку; псіхалінгвістыку, матэматычную лінгвістыку;* тэорыю перакладу; *этналінгвістыку* і інш. З А.м. цесна звязана *прыкладное мовазнаўства*, а таксама вывучэнне канкрэтных моў або груп моў. Фарміраванне А.м. адбывалася з пач. 19 ст., найперш у працах В.Гумбальта. Уклад у яго развіццё зрабілі А.А.Патабня, І.А.Бадуэн дэ Куртэнэ, Ф. дэ Сасюр. На Беларусі першыя публікацыі агульналінгвістычнага характару з'явіліся ў 1920-я г. («Асноўныя пытанні мовазнаўства» П.А.Бузука, 1926). Бел. мовазнаўцы вывучаюць агульналінгвістычныя праблемы знакавага (семіялагічнага) характару мовы (В.У.Мартынаў), прыкладнога мовазнаўства (У.А.Карпаў, У.А.Зубаў), эксперым. фанетыкі (К.К.Барышнікава, Г.А.Мятлюк, А.І.Падлужны), агульнай лексікалогіі (А.І.Кісялеўскі, Б.А.Плотнікаў), стылістыкі (М.Я.Цікоцкі), псіхалінгвістыкі (Г.П.Кліменка, Б.Ю.Норман), тэорыі перакладу (П.І.Копанеў, В.П.Рагойша), сацыялінгвістыкі (Н.Б.Мячкоўская), двухмоўя (М.В.Бірыла, М.Г.Булахаў, А.Я.Міхневіч, П.П.Шуба). У Ін-це мовазнаўства АН Беларусі створаны аддзел, у БДУ і Гродзенскім ун-це — кафедры тэарэтычнага і слав. мовазнаўства.

*Літ.:* Мечковская Н.Б., Плотников Б.Н., Супрун А.Е. Общее языкознание: Сущность и история языка. Мн., 1993.

*А.Я.Супрун.*

**АГУЛЬНАЕЎРАПЕ́ЙСКАЯ НАРА́ДА**, гл. *Арганізацыя па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе.*

**АГУЛЬНАЗЕ́МСКІЯ ПРЫВІЛЕ́І**, заканадаўчыя акты ВКЛ, якія дзейнічалі на тэр. ўсёй дзяржавы і замацоўвалі правы розных сац. груп, найперш шляхты. Найб. вядомыя тры прывілеі 1387 вял. князя ВКЛ Ягайлы, два з іх (ад 20 і 22 лют.) вызначалі льготы феадалам за пераход у каталіцтва, вызвалялі каталіцкае духавенства ад дзярж. павіннасцяў і падаткаў. *Гарадзельскі прывілей 1413* замацоўваў унію ВКЛ з Польшчай, пашыраў правы феадалаў-католікаў і абмяжоўваў правы правасл. феадалаў. Прывілеямі 1432 і 1434 правасл. феадалам даваліся такія ж правы, як і католікам. Апошні прывілей гарантаваў асабістую свабоду і недатыкальнасць шляхты. *Прывілеем 1447* вял. кн. Казімір забараняў надзяляць чужынцаў, у т.л. палякаў, пасадамі, маёнткамі, землямі і чынамі ў ВКЛ, абмяжоўваў права пераходу сялян ад аднаго феадала да другога. *Прывілеем 1492* вял. кн. Аляксандр пацвердзіў ранейшыя правы шляхты, вызначыў асновы адм., цывільнага і крымін. права. У 1506 Жыгімонт I Стары выдаў прывілей, які пацвердзіў усе папярэднія прывілеі, дадзеныя духоўным і свецкім феадалам, гарадам, мяшчанам і наогул асобам усякага стану. Ім завяршыўся першы этап развіцця пісанага права ў форме А.п., потым асн. законамі краіны сталі Статуты ВКЛ 1529, 1566, 1588 (пра кожны гл. асобны арт).

*Я.А.Юхо.*

**АГУ́ЛЬНАЙ І НЕАРГАНІ́ЧНАЙ ХІ́МІІ ІНСТЫТУ́Т** Акадэміі навук Беларусі, навукова-даследчая ўстанова па распрацоўцы тэарэт. і практычных праблем агульнай і неарган. хіміі. Засн. ў 1959 у Мінску на базе Ін-та хіміі АН БССР (з 1929). Асн. кірункі навук. даследаванняў: сінтэз адсарбентаў і каталізатараў, неарган. матэрыялаў з зададзеным комплексам спец. уласцівасцяў; паверхневыя з'явы і дысперсныя сістэмы. Распрацаваны: тэхналогіі атрымання новых формаў мінер. угнаенняў; рэагентныя сумесі для флатацыі калійных рудаў Старобінскага радовішча; тэхналогіі хімічна ўстойлівых шклоэмаляў для апаратуры і трубаправодаў са сталі, актываваных вугальных валокнаў і тканін, вогнебіяахоўных матэрыялаў, святлоадчувальных кампаўндаў і лакаў, медыцынскіх геляў.

**АГУЛЬНАНАРО́ДНАЯ МО́ВА**, агульнавядомая, зразумелая ўсім носьбітам, шырокаўжывальная ў размоўнай паўсядзённай практыцы, не абмежаваная якімі-н. стылямі разнавіднасць *нацыянальнай мовы*. Бел. А.м. ўключае найб. ужывальныя моўныя сродкі (у першую чаргу лексічныя), пашырана на ўсёй тэр. Беларусі. У сучасным грамадстве ролю А.м. выконвае бел. *літаратурная мова*, якая служыць агульнанац. сродкам моўных зносін. Сучасная бел. літ. мова (асабліва яе размоўная разнавіднасць) як А.м., у адрозненне ад тэрытарыяльных (*дыялект*) і сацыяльных (*сацыяльны дыялект, арго*) разнавіднасцяў, з'яўляецца зразумелай для ўсіх беларусаў і служыць сродкам моўнага адзінства нацыі.

*А.А.Лукашанец.*

**АГУЛЬНАРУ́СКІЯ ЛЕТАПІ́СНЫЯ ЗБО́РЫ**, летапісныя помнікі, якія ўключалі летапісанне розных цэнтраў сярэдневяковай Русі і выкладалі гісторыю асобных абласцей і княстваў з агульнарус. пункту гледжання. У 12—13 ст. складаліся ў манастырах і пры дварах ўладзімірскіх князёў, у 14—16 ст. — пераважна пры дварах мітрапалітаў і вял. рус. князёў. Характарызуюцца разнастайнасцю крыніц і шырынёй паліт. кругагляду. Паняцце «А.л.з.» ўведзена А.А.*Шахматавым*. Іх з'яўленне ён звязваў з дзейнасцю рус. мітрапалітаў і датаваў пач. 14 ст. У сучаснай гіст. навуцы першым з А.л.з. прынята лічыць *«Аповесць мінулых гадоў»*.

**АГУ́ЛЬНАЯ А́ФРА-МАЎРЫКІ́ЙСКАЯ АРГАНІЗА́ЦЫЯ** (Organisation Commune Africaine et Mauricienne; ОКАМ), аб'яднанне афрыканскіх дзяржаў. Створана на базе Афра-малагасійскага саюза (засн. ў 1961; з 1964 Афра-малагасійскі саюз эканам. супрацоўніцтва, у 1965—74 Агульная афра-малагасійская і маўрыкійская арг-цыя). Уваходзяць (1994): Бенін, Буркіна-Фасо, Котд'Івуар, Маўрыкій, Нігер, Руанда, Сенегал, Сейшэльскія Астравы, Тога, Цэнтральнаафрыканская Рэспубліка (ЦАР). Гал. мэта — умацаванне эканам., сац., тэхн. і культ. супрацоўніцтва краін-удзельніц. Вышэйшы орган — канферэнцыя кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў. Штабкватэра ў г. Бангі (ЦАР). Друкаваны орган час. «Nations Nouvelles» («Нацыянальныя навіны»).

**АГУ́ЛЬНАЯ ЛІНГВІ́СТЫКА**, тое, што *агульнае мовазнаўства*.

**АГУ́ЛЬНАЯ МЕ́РА** дзвюх або некалькіх аднародных велічыняў, велічыня таго ж роду, якая ўтрымлівае цэлы лік разоў ва ўсіх зададзеных велічынях. Дзве велічыні, што не маюць А.м., наз. несувымернымі (гл. *Сувымерныя і несувымерныя велічыні*).

**АГУ́ЛЬНАЯ ТЭО́РЫЯ АДНО́СНАСЦІ**, гл. ў арт. *Адноснасці тэорыя*.

**АГУ́ЛЬНАЯ ТЭО́РЫЯ СІСТЭ́М**, навуковая канцэпцыя даследавання аб'ектаў, якія ўяўляюць сабой *сістэмы*. Цесна звязана з *сістэмным падыходам*, з'яўляецца канкрэтызацыяй і логіка-метадалагічным выражэннем яго прынцыпаў і метадаў. А.т.с., адну з першых версій якой распрацаваў Л.Берталанфі, абагульняе прынцыпы цэласнасці, арг-цыі, эквіфінальнасці (дасягнення сістэмай аднолькавага канчатковага стану пры розных зыходных умовах) і ўзаемаадназначнай адпаведнасці — ізамарфізму (гл. *Ізамарфізм і гомамарфізм*). У межах гэтай канцэпцыі было арганізавана даследаванне адкрытых сістэм, якія пастаянна абменьваюцца рэчывам і энергіяй са знешнім асяроддзем. У 1950—70-я г. існавалі і інш. падыходы да пабудовы А.т.с. (М.Месаровіч, Л.Задэ, Р.Акоф, Дж. Клір, У.Н.Садоўскі, А.І.Уёмаў, Ю.А.Урманцаў, Р.Калман, Э.Ласла і інш); асн. ўвага звярталася на распрацоўку логіка-канцэптуальнага і матэм. апарата сістэмных даследаванняў.

*Літ.:* Садовский В.Н. Основания общей теории систем: Логико-методол. анализ. М., 1974; Уёмов А.И. Системный подход и общая теория систем. М., 1978; Bertalanffy Z. v. General system theory: Foundations, development, applications. New York, 1969.

**АГУ́ЛЬНАЯ ЎЛА́СНАСЦЬ**, маёмасць, якая адначасова належыць двум і болей уласнікам, незалежна ад формы ўласнасці. У Рэспубліцы Беларусь можа належаць двум або некалькім арг-цыям, дзяржаве і адной або некалькім арг-цыям, двум і болей грамадзянам. А.ў., у якой вызначана доля, што належыць кожнаму ўласніку, з'яўляецца іх долевай уласнасцю. А.ў., дзе такая доля не вызначана, — іх сумесная ўласнасць. Валоданне, карыстанне і распараджэнне А.у. ажыццяўляецца са згоды ўсіх яе ўдзельнікаў; у выпадку рознагалосся вызначаецца праз суд па іску любога з яе ўдзельнікаў.

Кожны ўдзельнік агульнай долевай уласнасці абавязаны суразмерна са сваёй доляй удзельнічаць у выдатках на зборы, падаткі і інш. плацяжы па агульнай маёмасці; мае права на адчужэнне сваёй долі інш. асобе ці вылучэнне яе з агульнай маёмасці. Пры продажы долі пабочнай асобе астатнія ўдзельнікі агульнай долевай уласнасці маюць пераважнае права куплі. *Г.А.Маслыка.*

**«АГУ́ЛЬНЫ ДАГАВО́Р» 1952**, Бонскі дагавор. Падпісаны паміж урадамі ЗША, Вялікабрытаніі і Францыі з аднаго боку і ФРГ з другога 26 мая ў Боне. Адмяняў акупац. статут на тэр. Зах. Германіі і ствараў дагаворную аснову для адносін паміж гэтымі дзяржавамі.

Паводле «А.д.» ўрад ФРГ абавязваўся выконваць усе заключаныя раней ад імя Зах. Германіі дагаворы і пагадненні. ЗША, Вялікабрытанія і Францыя пакідалі за сабой права размяшчаць на тэр. ФРГ свае войскі. «А.д.» падлягаў ратыфікацыі ўсімі краінамі-ўдзельніцамі і павінен быў уступіць у дзеянне разам з *Парыжскім дагаворам 1952*. Паколькі Нац. сход Францыі 30.8.1954 Парыжскі дагавор адхіліў, «А.д.» страціў сваю сілу. З некаторымі папраўкамі ён быў уключаны ў *Парыжскія пагадненні 1954*.

**АГУ́ЛЬНЫ ПРАЦО́ЎНЫ СТАЖ**, гл. ў арт. *Працоўны стаж*.

**«АГУ́ЛЬНЫ РЫ́НАК»**, назва *Еўрапейскага эканамічнага супольніцтва*.

**АГУ́ЛЬНЫ СЫРТ**, платопадобнае ўзвышша на ПдУ Еўрап. часткі Расіі, водападзел рэк басейнаў Волгі і Урала. Працягваецца з З на У на 500 км, на У прымыкае да Паўд. Урала. Выш. да 405 м. Складзены з пясчанікаў, глін і вапнякоў. Месцамі трапляюцца купалападобныя астанцы—шыханы. Развіты карст. Дзірваніста-злакавыя, пераважна ўзараныя, стэпы. Пасевы збожжавых культур.

**АГУ́ЛЬЯС**, Агульяш (Agulhas; ад партут. agulha іголка), паўд. мыс Афрыкі; гл. *Ігольны мыс*.

**АГУ́ЛЬЯС** (Agulhas), Ігольнага мыса катлавіна, падводная катлавіна на граніцы Індыйскага і Атлантычнага акіянаў, паміж мацерыковымі схіламі Паўд. Афрыкі і Афрыканска-Антарктычным хрыбтом. Даўж. каля 1100 км, шыр. каля 1000 км, глыб. да 6150 м.

**АГУ́ЛЬЯСАВА ЦЯЧЭ́ННЕ**, гл. *Ігольнага мыса цячэнне*.

**АГУНО́ВІЧ** Эдуард Канстанцінавіч (н. 16.12.1938, г. Рэчыца), бел. мастак. Засл. работнік культуры Беларусі (1977). Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1966). Удзельнік маст. выставак з 1966. Працуе ў кніжнай і станковай графіцы, акварэлі, маст. афармленні музеяў, выставак, спектакляў. Аўтар праектаў маст. афармлення экспазіцый Дома-музея І з'езда РСДРП у Мінску, музея сав.-польскай баявой садружнасці ў в. Леніна Горацкага р-на Магілёўскай вобл., філіяла Нац. музея гісторыі і культуры Беларусі ў Заслаўі Мінскага р-на, Літ. музея Я.Купалы ў Мінску і яго філіяла ў в. Вязынка Маладзечанскага р-на Мінскай вобл., Літ. музея М.Багдановіча ў Мінску (Дзярж. прэмія Беларусі 1993) і інш. Афарміў бел. аддзелы на выстаўках СССР у Індыі і ГДР (1976, 1980). Работы ў кніжнай графіцы: афармленне і іл. да паэм «Тарас на Парнасе» (1967), «Сымон-музыка» Я.Коласа (1968) і інш. Аўтар станковых работ: серыі ў тэхніцы афорта «Дзяцінства» (1977), «Маці Божая, Маці Краіна» (1979), «Спрадвечнае» (1980), «Крык кнігаўкі» (1981).

**АГУРО́К** (Cucumis), род аднагадовых травяністых раслін сям. гарбузовых. Вя-

Э.Агуновіч. Маці Божая, Маці Краіна. 1979.

дома каля 30 відаў, гал. ч. у Афрыцы, некалькі відаў у Азіі. Найб. пашыраны А. пасяўны (C. sativus). Радзіма — Індыя, дзе А. вядомы за 3 тыс. г. да н.э. Вырошчваецца ў многіх краінах свету, пераважна ў зоне ўмеранага клімату. Адна з пашыраных харч. культур.

Сцябло паўзучае, даўж. да 1,5 м, з простымі вусікамі, шорсткаапушанае. Лісце чаргаванае, 5-лопасцевае, радзей суцэльнае. Кветкі ў пазухах, аднаполыя, мужчынскія, адзіночныя або ў шчытках, жан. адзіночныя. Плод — гарбузіна, розная па форме і велічыні (даўж. 5—70 см); ёсць партэнакарпічныя (безнасенныя) формы. Святло- і вільгацелюбівая расліна кароткага дня, скараспелая, патрабавальная да цяпла і ўрадлівасці глебы. Вырошчваецца ў адкрытым грунце і ў цяпліцах з насення або расады. Вегетац. перыяд ва ўмовах Беларусі 90—105 сут. Добра расце на супясчаных і лёгкіх сугліністых глебах, багатых перагноем. Ураджайнасць у адкрытым грунце 12—46 т/га, у цяпліцах 15—25 кг з 1 м². Плады маюць у сабе ваду (95—96%), цукры, бялковыя рэчывы, клятчатку, мінер. элементы, вітаміны, арган. к-ты і інш. рэчывы. Найб. папулярныя сарты на Беларусі Доўжык, Зграбны, Нежынскі мясцовы, Нерасімы 40; перспектыўныя — Беларускі, Вадалей, Дэкан, Канкурэнт, Куставы і інш. Асн. шкоднікі А.: парасткавая муха, тля, павуцінны клешчык; хваробы: перанаспароз, мучністая раса, аліўкавая плямістасць.

*Літ.:* Огурцы. 2 изд. Мн., 1987; Ерохин И.Е., Стрельцов С.Д. Огурцы и томаты: на грядке, в теплице, в комнате. 2 изд. Донецк, 1991.

**АГУРО́ЧНІК**, бурачнік (Borago), род адна- і шматгадовых травяністых раслін сям. бурачнікавых. 3 віды, пашыраныя пераважна ў Міжземнамор'і. Лёгка дзічэе, як пустазелле трапляецца ў Еўропе і Зах. Азіі. На Беларусі — А. лекавы, або агурочная трава (D. officinalis), — адналетнік.

Выш. 30—100 см, сцябло прамастойнае. Лісце суцэльнае з агурочным пахам і смакам (адсюль назва). Цвіце ў чэрв. — ліпені. Кветкі блакітныя, руковыя, белыя, у суквецці-завітках. Плод — чатырохарэшак. Лекавая (мачагонны, патагонны, змякчальны сродак), меданосная і дэкар. расліна, вырошчваюць як агародніну (маладое лісце прыдатнае на салату).

**АГУ́РСКІ** Самуіл Хаімавіч (29.4.1884, Гродна — 19.8.1947), бел. гісторык. Чл.-кар. АН БССР (1936). Удзельнік рэв. руху ў 1905—07, чл. Бунда. З 1906 у эміграцыі. Пасля Лют. рэв. 1917 вярнуўся на Беларусь, у 1918 уступіў у КП(б)Б, быў ваен. камісарам у Віцебску. У 1924—33 на кіруючых пасадах у парт.-навук. установах Мінска і Масквы, з 1934 нам. дырэктара Ін-та нац. меншасцяў АН Беларусі. Аўтар прац па гісторыі рэв. руху на Беларусі. Лічыў праявай нацыяналізму святкаванне ў 1926 юбілею бел. газет «Наша доля» і «Наша ніва»; паўстанне 1863—64 характарызаваў як рэакц. памешчыцка-клерыкальнае; абвінавачваў У.Ігнатоўскага і З.Жылуновіча ў нацыяналізме. Бел. нац. рух пасля Лют. рэв. 1917 характарызаваў як шавіністычны. У 1938 арыштаваны, у 1939 сасланы ў Казахстан на 5 гадоў. Рэабілітаваны ў 1956.

**АГУ́ЦІ**, гарбатыя зайцы (Dasyprocta), род млекакормячых атр. грызуноў. 20 відаў. Жывуць каля рэк у трапічных лясах і сухіх саваннах Паўд. і Цэнтр. Амерыкі, в-ва Трынідад і М.Антыльскіх а-воў на выш. да 2 км.

Даўж. цела 41—62 см, хваста 1—3,5 см, маса 1,3—4 кг. Афарбоўка ад ярка-залацістай (D. aguti) да цёмна-шэрай (D. fuliginosa). На доўгіх задніх нагах 3 пальцы. Добра плаваюць. Кормяцца лісцем, пладамі, арэхамі. Шкодзяць плантацыі цукр. трыснягу. Аб'ект палявання.

**А́ДА** (Adda), рака на Пн Італіі, левы прыток р. По. Даўж. 313 км, пл. бас. 8 тыс. км². Пачынаецца ў Альпах з воз. Канкана.

Агурок.

Агурочнік лекавы.

У вярхоўі цячэ па даліне Вальтэліна, цераз воз. Кома, перасякае перадгор'і Ламбардскіх Перадальпаў, у ніжнім цячэнні — па Падан-скай раўніне. Паводкі вясной, летам і восенню. Сярэдні расход вады каля 250 м³/с. ГЭС. Злучана каналам з г. Мілан.

**АДА́Д**, Адуа, у шумера-акадскай міфалогіі бог грому, навальніцы, ветру. Увасабляе і згубныя і пладаносныя сілы прыроды. Малюецца з малатам у адной руцэ і пуком маланак у другой. Эмблемай А. звычайна быў двухзубец ці трызубец маланкі. У іканаграфіі з вобразам А. звязваецца бык як сімвал урадлівасці і неўтаймоўнасці.

**АДА́ЖЫО** (італьян. adagio літар. спакойна, павольна). У музыцы: 1) павольны тэмп; 2) назва п'есы або часткі (звычайна 2-й) цыклічнага твора ў тэмпе А. У балеце: 1) павольная сольная або дуэтная кампазіцыя; 2) асн. частка складаных танц. формаў (па-дэдэ, гран па і інш.); 3) комплекс рухаў каля станка і на сярэдзіне залы, які выпрацоўвае ўстойлівасць, уменне спалучаць рухі ног, рук, корпуса.

**АДА́Й-ХОХ**, вяршыня Гал. хрыбта Вял. Каўказа на Пд ад Цэйскага ледавіка, у Паўн. Асеціі. Выш. 4408 м.

**АДАЛЕСКА́РЫЙ** (ад лац. adolesco падрастаю), лічынкавая стадыя некаторых паразітных *трэматод*. Развіваецца ў навакольным асяроддзі з *цэркарыя*, выдзеленага прамежкавымі гаспадарамі (малюскамі). З вадой ці кормам трапляе ў арганізм канчатковага гаспадара (пазваночныя жывёлы, чалавек), дзе развіваецца ў палавасталую трэматоду. Стадыя А. ўласціва, напр., цыклу развіцця пячоначнай двухвусткі — узбуджальніка *фасцыялёзу*.

**АДА́ЛІЯ**, другая назва г. *Анталья* ў Турцыі.

**АДА́М** (стараж.-яўр. чалавек), у *Біблії* і *Каране* першы чалавек, прабацька ўсіх людзей, якога стварыў Бог па сваім падабенстве і пасяліў з *Евай* у раі, адкуль яны былі выгнаны за грэхападзенне. Паводле падання, пражыў 930 гадоў і быў пахаваны на Галгофе на тым месцы, дзе пазней быў распяты на крыжы Ісус Хрыстос.

**А́ДАМ**( Adam) Роберт (3.7.1728, г. Керколды, Вялікабрытанія — 3.3.1792), англ. архітэктар, прадстаўнік класіцызму. Разам з братам Джэймсам праектаваў рацыянальныя па планіроўцы сядзібныя дамы (Кенвуд-хаўс у Лондане, 1767—69), грамадскія будынкі (ун-т у Эдынбургу, 1789—91), гар. кварталы (Адэльфі ў Лондане, 1768—72) і інш. Выкарыстоўваў строгія класічныя формы, вытанчаны дэкор, надаваў вял. значэнне афармленню інтэр'ера, мэблі.

**АДА́М** (Адамус) Рэйнальд (1602, зямля Рэйнланд-Пфальц, Германія — ?), кальвінісцкі тэолаг, педагог у ВКЛ. Адукацыю атрымаў у Лейдэнскім ун-це (Нідэрланды). Выкладаў у Слуцкай школе. Адзін з аўтараў выдадзеных у

Любчы статута, праграмы і раскладу заняткаў для гэтай школы (1628), аўтар дапаможнікаў па рыторыцы і гісторыі (1629). У кнігах А. ёсць звесткі аб прыродзе і жыхарах Беларусі. З 1642 працаваў на Беларусі інспектарам школ і бібліятэкарам.

**АДА́М БРЭ́МЕНСКІ** (Adam von Bremen; ? — паміж 1081 і 1085), паўночна-герм. храніст, брэменскі канонік. Аўтар працы «Жыццяпісы епіскапаў Гамбургскай царквы» (паміж 1072 і 1076, 4 кн., на лац. мове), засн. на хроніках, манастырскіх аналах, дакументах з архіва Брэменскага архіепіскапства і інш., у якіх адлюстраваны гісторыя, геаграфія, культура, побыт скандынаваў і зах. славян, гісторыя славяна-герм. адносін.

**АДАМА́ЙЦІС** (Adomaitis) Рэгімантас (н. 31.1.1937, г. Шаўляй), літоўскі акцёр. Нар. арт. СССР (1985). Скончыў акцёрскае аддз. Кансерваторыі Літвы (1962). Працаваў у Капсукскім і Каўнаскім драм. т-рах, з 1967 у Т-ры драмы Літвы. Мастацтва А. вызначаецца псіхал. глыбінёй, тонкай іроніяй. За ролі Міндаўгаса, Мажвідаса («Міндаўгас», «Мажвідас» Ю.Марцінкявічуса), Йуна («Йун Габрыэль Боркман» Г.Ібсена) у т-ры Дзярж. прэмія Літвы 1982. У кіно выявіліся яго моцны тэмперамент, здольнасць ствараць складаныя і супярэчлівыя характары: «Ніхто не хацеў паміраць», «Кароль Лір», «Гэта салодкае слова — свабода», «Кентаўры», «Аварыя», «Багач, бядняк» (два апошнія фільмы — тэлевізійныя).

**АДАМАНТА́Н**, трыцыкладэкан, хімічнае злучэнне, насычаны цыклічны вуглевадарод $C_{10}H_{16}$, мал. м. 136,23. Бясколерныя лятучыя крышталі з пахам камфоры, $t_{пл}$=269 °С, шчыльн. $1{,}07 \cdot 10^3$ кг/м$^3$. Устойлівы да 660 °С, яго атамы вугляроду ўтвараюць структуру алмазу. А. і яго гамолагі ёсць у нафце.

Атрыманы ізамерызацыяй з тэтрагідрапентадыену. Вытворныя А. выкарыстоўваюцца як лек. сродкі (рэмантадзін), сінт. змазкі, мадыфікатары для атрымання злучэнняў з высокай тэрмічнай і хім. трываласцю.

**АДАМА́Р** (Hadamard) Жак (8.12.1865, Версаль — 17.10.1963), французскі матэматык. Чл. Парыжскай АН (з 1912), замежны чл. АН СССР (з 1929, чл.-кар. з 1992). Скончыў Вышэйшую нармальную школу ў Парыжы (1890). Праф. Калеж дэ Франс (1897—1935), Парыжскага ун-та і політэхн. школы (1900—35) і інш. Навук. працы па дыферэнцыяльных ураўненнях, тэорыі функцый, тэорыі лікаў, праблемах устойлівасці ў механіцы. Даследаванні А. зрабілі значны ўплыў на стварэнне функцыянальнага аналізу.

*Літ.:* Л е в и П. Жак Адамар // Успехи мат. наук. 1964. Т. 19, вып. 3 (117).

**АДА́МАЎ** Аркадзь Рыгоравіч (н. 13.7.1920, Масква), рус. пісьменнік. Скончыў Маскоўскі ун-т (1948). Аўтар кніг, прысвечаных рус. даследчыкам, падарожнікам-першаадкрывальнікам. З сярэдзіны 1950-х г. працуе ў дэтэктыўна-прыгодніцкім жанры: аповесці «Справа «стракатых» (1956), «Зграя» (1966), «...З многімі невядомымі» (1967—68), «Вячэрні круг» (1982), раманы «Злым ветрам» (1973) і «Пятля» (1975).

**АДА́МАЎ** Уладзімір Уладзіміравіч (12.6.1875, С.-Пецярбург — 1937 ?), батанік, адзін з першых даследчыкаў расліннасці Беларусі. Скончыў Пецярбургскі ун-т (1899). У 1920—35 заг. аддзела Мінскай балотнай доследнай станцыі, секцыі Бел. аддз. Усесаюзнага Ін-та прыкладной батанікі; кіраўнік геабатанічнай экспедыцыі Наркамзема БССР. Заснавальнік Вялікалятчанскага батанічнага саду (каля Віцебска) і батанічнага саду БДУ. Асн. працы па сістэматыцы раслін, дэндралогіі, геабатаніцы.

*Тв.:* Обзор растительности Белорусского Полесья. Мн., 1928 (разам з А.Д.Лазук).

**АДА́МАЎ МОСТ**, ланцуг скал, водмеляў, невял. каралавых астравоў у

Агуці.

Полкскім праліве, паміж п-вам Індастан і в-вам Шры-Ланка. Даўж. каля 30 км. Належыць Індыі і Шры-Ланцы. След былой сухапутнай сувязі в-ва Шры-Ланка з мацерыком Еўропы—Азіі.

Назва звязана з паданнем пра шлях Адама, выгнанага з раю на зямлю (на в-аў Шры-Ланка), які перайшоў па А.м. на мацярык.

**АДА́МАЎ ЯБЛЫК**, кадык, анатамічнае ўтварэнне ў выглядзе прамавугольнага выступу на пярэдняй паверхні шыі ў мужчын. Складзена з пласцінак шчытападобнага храстка гартані. Назва па біблейскай легендзе аб праглынутым Адамам яблыку.

**АДАМЕ́ЙКА** Марыя Уладзіміраўна (20.5.1929, Днепрапятроўск — 13.6.1990), беларуская спявачка. Засл.



Жалезнае крэсіва з селішча Адаменка.

арт. Беларусі (1963). З 1952 салістка Дзярж. нар. хору Беларусі. Выканальніца бел. нар. жартоўных песень і прыпевак (сола і ў дуэце з Г.*Аўдзеенка*).

**АДА́МЕНКА**, селішча і бескурганны могільнік *кіеўскай культуры* (паводле Л.Д.Побаля — позназарубінецкай) на Беларусі, каля в. Адаменка Быхаўскага

Алесь Адамовіч.

р-на Магілёўскай вобл. (у л-ры вядома і пад назвай Абідня), ва ўрочышчы Абідня. Раскапана каля 25% плошчы селішча і 12 пахаванняў з трупаспаленнем на могільніку. Выяўлены рэшткі наземных слупавых жытлаў, 29 паўзямлянак зрубнай канструкцыі, шкляныя пацеркі, фібулы, манета Геты (209—212), падвескі з эмаллю (гл. *Абідзенскія эмалі*) і інш.

**АДАМО́ВА**, вёска ў Беларусі, у Сакаўшчынскім с/с Валожынскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса імя І.Д.Чарняхоўскага. За 20 км на З ад Валожына, 100 км ад Мінска, 14 км ад чыг. ст. Багданаў, 2 км ад шашы Мінск—Гродна. 255 ж., 93 двары (1995). Базавая школа, б-ка, Дом культуры, аддз. сувязі.

**АДАМО́ВА**, вёска ў Беларусі, у Полацкім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр сельсавета. Чыг. ст. на лініі Віцебск—Даўгаўпілс. За 33 км на ПнЗ ад Полацка, 138 км ад Віцебска. 42 ж., 28 двароў (1994). Аддз. сувязі.

**АДАМО́ВІЧ** Адам Іосіфавіч (5.12.1802, Вільня — 30.4.1881), вучоны-медык, гісторык навукі. Д-р медыцыны (1824), праф. (1835). Скончыў Віленскую гімназію (1818), мед. ф-т Віленскага ун-та (1822). Выкладаў у Віленскім ун-це і Ветэрынарным ін-це Мед.-хірург. акадэміі. З 1842 гал. ўрач шпіталя ў Вільні. Аўтар навук. прац па ветэрынарыі, параўнальнай анатоміі, палеанталогіі і гісторыі медыцыны на Беларусі і ў Літве. Прэзідэнт Віленскага т-ва ўрачоў (з 1841).

*В.А.Гапоненка.*

**АДАМО́ВІЧ** Алесь (Аляксандр Міхайлавіч; 3.9.1927, в. Канюхі Капыльскага р-на Мінскай вобл. — 26.1.1994), бел. пісьменнік, крытык, літ.-знавец, грамадскі дзеяч. Чл.-кар. АН Беларусі (1980), д-р філал. н. (1962), праф. (1971). У Вял. Айч. вайну партызан.

Скончыў БДУ (1950), у 1962—64 слухач Вышэйшых сцэнарных курсаў (Масква). З 1954 працаваў у Ін-це л-ры АН Беларусі, з 1987 дырэктар НДІ кінамастацтва (Масква). Літ. дзейнасць пачаў у 1953 як крытык. Найб. значныя літ.-знаўчыя манаграфіі «Беларускі раман» (1961), «Маштабнасць прозы» (1972), «Здалёк і зблізку» (1976), «Браму скар-

Я.А.Адамовіч.

баў сваіх адчыняю...» (1980), «Вайна і вёска ў сучаснай літаратуры» (1982), «Нічога важней» (1985). Як крытык змагаўся супраць дагматычных уяўленняў пра л-ру, дбаў пра эстэт. аналіз, спалучаў яго са сцвярджэннем гуманіст. каштоўнасцяў. Адраджаў і развіваў знішчаныя ў перыяд сталінізму метадалагічныя прынцыпы праўдзівасці і гістарызму. З 1959 выступаў як празаік. Пісаў на бел. і рус. мовах. У дылогіі «Партызаны» (раманы «Вайна пад стрэхамі», 1960, «Сыны ідуць у бой», 1963) раскрыў вытокі нар. супраціўлення акупантам у Вял. Айч. вайну (аднайм. кінадылогія на кінастудыі «Беларусьфільм», 1970, сцэнарый А. ў сааўт.). Змаганне з таталітарызмам у абліччы фашызму і камунізму складае асн. пафас «Хатынскай аповесці» (1972, Дзярж. прэмія Беларусі імя Я.Коласа 1976), рамана «Карнікі» (1980), аповесцяў «Венера» і «Нямко» (абедзве 1993). Па матывах «Хатынскай аповесці» кінафільм «Ідзі і глядзі» (сцэнарый А. і Э. Клімава, залаты медаль на Маскоўскім міжнар. кінафестывалі, 1985). У дакумент. кнізе «Я з вогненнай вёскі...» (1975, з Я.Брылём і У.Калеснікам) расказана пра трагедыю бел. Хатыняў. У апошнія гады жыцця выявіў сябе як паліт. дзеяч, змагаўся з пагрозай ядзернай вайны. Публіцыстыка А. ў кн. «Выберы — жыццё» (1986), «Дадумваць да канца» (1988), «Мы — шасцідзесятнікі» (1991), «Апакаліпсіс па графіку» (1992).

*Тв.:* Собр. соч. Т. 1—4. Мн., 1981—83.

*Літ.:* Мележ І. Пра «Хатынскую аповесць» // Зб. тв. Мн., 1983. Т. 8; Брыль Я. Алесь Адамовіч // Зб. тв. Мн., 1981. Т. 4; Быкаў В. [Алесь Адамовіч] // Быкаў В. На крыжах. Мн., 1992; Каваленка В. Святло вялікіх мэт // Полымя. 1977. № 9; Дедков И. Во имя справедливости // Адамович А. Каратели. М., 1981.

*М.А.Тычына.*

**АДАМО́ВІЧ** Аляксандр Фаміч (студз. 1900, в. Васюлькі Мядзельскага р-на Мінскай вобл. — 1937), парт. і дзярж. дзеяч БССР. Скончыў пач. вучылішча ў Радашковічах (1915). У 1916—19 у Адэсе, уваходзіў у бел. культ.-асв. арг-цыю «Беларускі гай». З 1918 чл. Бел. сацыяліст. грамады, у 1919 чл. Камуніст. партыі. З 1926 чл. ЦК КП(б)Б. З 1922 інструктар, заг. аддзела Бабруйскага пав. к-та КП(б)Б, інтруктар ЦК КП(б)Б, сакратар Калінінскага акр. к-та КП(б)Б (г. Клімавічы), сакратар Полацкага акр. к-та КП(б)Б, заг. аддзела друку ЦК КП(б)Б, рэдактар газ. «Беларуская вёска». У 1928—29 нам. наркома земляробства БССР. У вер. 1929 выключаны з партыі, звольнены з пасады. У ліп. 1930 арыштаваны органамі АДПУ і зняволены на 10 гадоў. У 1937 прыгавораны да пакарання смерцю. Рэабілітаваны ў 1988.

**АДАМО́ВІЧ** Антон (н. 26.6.1909, Мінск), гісторык і літаратуразнавец. З 1928 вучыўся ў БДУ. У 1930 арыштаваны па надуманай справе «Саюза вызвалення Беларусі» і высланы ў Расію. У 1938 вызвалены; вярнуўся ў Мінск, скончыў БДУ. У час 2-й сусв. вайны чл. Цэнтр. рады Бел. нар. самапомачы, прэзідыума Бел. навук. т-ва, рэферэнт па справах прапаганды і прэсы пры Ген. камісарыяце Беларусі, супрацоўнік рэдакцыі «Менскай газэты» («Беларускай газэты»). Пасля вайны ў Зах. Германіі рэдагаваў бел. эмігранцкія газеты і часопісы. Адзін са стваральнікаў Мюнхенскага ін-та па вывучэнні СССР, кіраўнікоў бел. рэдакцыі радыёстанцыі «Свабода». З 1960 у ЗША. Аўтар прац па гісторыі, эканоміцы і культуры Беларусі: «Бальшавізм на шляхах устанаўлення кантролю над Беларуссю» (1954); «Бальшавізм у рэвалюцыйным руху на Беларусі» (1956); «Як дух змагання Беларусі (да 100-х угодкаў нараджэння Івана Луцкевіча)» (1983). Пісаў пра бел. л-ру («Максім Гарэцкі», 1928; «Якуб Колас у супраціве саветызацыі», 1955; «Супраціўленне саветызацыі ў беларускай літаратуры», 1958, на англ. мове). Аўтар тэндэнцыйных уступных арт. да эмігранцкіх выданняў твораў Н.Арсеневай, М.Багдановіча, А.Гаруна, У.Жылкі, Л.Калюгі, А.Мрыя, А.Салаўя, публікацый пра бел. паэтаў, якія былі рэпрэсіраваны (У.Дубоўка, Я.Пушча і інш.).

**АДАМО́ВІЧ** Багуслаў (13.1.1870, Мінск — 1944), бел. мастак. Працаваў у жанры партрэта, у т.л. мініяцюрнага. Сярод работ партрэты С.Тарноўскай (1904, мініяцюра, Нац. музей Кракава), Ігната Дыгаса (1920, мініяцюра, акварэль, гуаш на косці, Тэатр. музей Варшавы) і інш.

**АДАМО́ВІЧ** Вячаслаў (Вацлаў) Антонавіч (19.2.1864, Віленская губ. — 21.2.1939), дзеяч бел. нац. руху пач. 20 ст., адзін з лідэраў яго правага, палонафільскага, крыла. У 1917 актывіст Бел. сацыяліст. грамады (БСГ), Вял. бел. рады, Цэнтр. бел. вайсковай рады. Кандыдат ад БСГ на выбарах ва Устаноўчы сход. У 1919—20 супрацоўнік вярбовачнага бюро Бел. вайсковай камісіі. Адзін са стваральнікаў арг-цыі «Зялёны дуб». Удзельнік канферэнцыі бел. паліт. арг-цый (Прага, вер. 1921), агітаваў за арыентацыю на Польшчу. Разам з П.Алексюком склікаў у Вільні Бел. з'езд (снеж. 1921), які аформіў праграму палонафільскай плыні бел. руху. Аўтар зб. абразкоў і легендаў «Тыпы Палесся» (1926, пад псеўд. Дзяргач).

**АДАМО́ВІЧ** Георгій Віктаравіч (19.4.1894, Масква — 21.2.1972), рус. паэт і літаратурны крытык. Скончыў Петраградскі ун-т (1917). Прыхільнік *акмеізму*, у пач. 1920-х г. уваходзіў у «Цэх паэтаў». З 1923 у эміграцыі, у Парыжы. Вядучы літаратурнага аддзела газ. «Последние новости» (1920—30-я г.). Аўтар зб-каў вершаў «Воблакі» (1916), «Чысцілішча» (1922), «Адзінства» (1967) і інш. Камернай лірыцы А. ўласцівыя матывы адзіноцтва, тугі, асуджанасці. У кн. «Адзінота і воля» (1955) артыкулы пра рус. пісьменнікаў 20 ст., у зб. «Каментарыі» (1967) эсэ пра літ. з'явы.

**АДАМО́ВІЧ** Язэп Аляксандравіч (7.1.1897, г. Барысаў — 22.4.1937), дзярж. дзеяч БССР. З сак. 1918 у Смаленску ў штабе Чырв. гвардыі, удзельнік задушэння стракапытаўскага мяцяжу. З вер. 1918 ваен. камісар Магілёўскага і Лепельскага ваен. Саветаў. З вер. 1920 нар. камісар па ваен. справах БССР, адначасова з 1921 нар. камісар унутр. спраў і нам. старшыні ЦВК і СНК БССР. Удзельнічаў у падрыхтоўчай рабоце па ўтварэнні СССР. У 1924 у складзе Часовага Бел. Бюро ЦК РКП(б) па ўзбуйненні тэр. Беларусі. У 1924—27 старшыня СНК БССР, у 1924—25 чл. РВС СССР. З 1927 чл. Прэзідыума ВСНГ СССР і старшыня праўлення Цукратрэста СССР, з 1932 на Д. Усходзе. Чл. ЦБ у 1920—22, ЦК і Бюро ЦК КП(б)Б у 1924, чл. ЦВК БССР у 1920—27 і СССР у 1924—29. Ва ўмовах масавых рэпрэсій скончыў жыццё самагубствам.

**АДАМО́ВІЧ** Ян, бел. гравёр па шкле 18 ст. Працаваў на шкламануфактурах Радзівілаў у мяст. Бяла-Падляска (цяпер Польшча), на мануфактуры ў в. Урэчча (Любанскі р-н Мінскай вобл.). У 1781 гравіраваў сталовы посуд і люстэркі.

**АДАМО́Ў** (Adamov) Арцюр (28.8.1908, г. Кіславодск, Расія — 15.3.1970), французскі драматург. У 1914 сям'я эмігравала з Расіі. Вучыўся ў Майнцы і Жэневе. З 1924 жыў у Парыжы. Літ. дзейнасць пачаў у канцы 1920-х г. сюррэалістычнымі вершамі. У 1942 быў вязнем канцлагера. Адчаем і разгубленасцю прасякнуты яго «Жахлівы дзённік» (1943) і аўтабіягр. аповесць «Прызнанне» (1946). У п'есах для «тэатра абсурду» (стваральнікам якога ён быў разам з

Э.*Іанеска* і С.*Бекетам*) «Пародыя», «Уварванне» (абедзве 1950), «Прафесар Таран» (1953) і інш. паказваў безвыходнасць, трагічную марнасць, абсурднасць жыцця, непазбыўную адзіноту. У фарсе «Усе супраць усіх» (1953) чалавек — марыянетка гіст. сітуацыі — то кат, то ахвяра. Вострая сац. праблематыка вызначае п'есы для паліт. тэатра: камедыю «Пінг-понг» (1955), трагіфарс «Паола Паолі» (1957), паліт. гратэск «Паліткыка адкідаў» (1962), трагікамедыю «Святая Еўропа» (1966), драму «Звыш меры» (1968) і інш. Аўтар зб. артыкулаў пра тэатр «Тут і зараз» (1964), кн. ўспамінаў «Чалавек і дзіця» (1968). Перакладаў п'есы А.Чэхава і М.Горкага, інсцэніраваў «Мёртвыя душы» М.Гогаля.

*Тв.:* Рус. пер. — Паоло Паоли // Пьесы современной Франции. М., 1960; Весна семьдесят первого. М., 1968.

*Літ.:* Проскурникова Т.Б. Французская антидрама. М., 1968.

**АДА́МПАЛЬ**, вёска ў Беларусі, у Нягневіцкім с/с Навагрудскага р-на Гродзенскай вобл. За 19 км на ПнУ ад Навагрудка, 40 км ад чыг. ст. Наваельня. 24 ж., 10 двароў (1994).

Заснавана каля 1810 Адамам Храптовічам (ад яго імя і назва вёскі) у маёнтку Нягневічы, купленым у кн. Радзівіла. У 2-й пал. 19 ст. адна з лепшых гаспадарак Рас. імперыі (упершыню на Беларусі выкарыстоўваліся шматпольныя севазвароты, меліяраваныя палі, наладжаны выраб галандскіх і швейцарскіх сыроў, якія збывалі за мяжу). У 1896 у фальварку А. працавалі спіртзавод (з 1878), млын, маслабойня, майстэрні, хлебазапасны магазін. У 1915 з-за акупацыі герм. войскамі фальварак спыніў дзейнасць. У 1921—39 у складзе Польшчы. У 1930-я г. ў А. дзіцячы прытулак, з 1944 дзіцячы дом, з 1960-х г. спец. школа-інтэрнат.

**А́ДАМС** (Adams) Джон (19.10.1735, Куінсі, штат Масачусетс, ЗША — 4.7.1826), дзяржаўны дзеяч ЗША. У час *Вайны за незалежнасць у Паўночнай Амерыцы 1775—83* член 1-га і 2-га Кантынентальных кангрэсаў. Удзельнічаў у падпісанні *Версальскага мірнага дагавора 1783*. Першы пасланнік ЗША у Англіі (1785—88), пазней адзін з лідэраў партыі федэралістаў. У 1789—97 — віцэ-прэзідэнт, у 1797—1801 прэзідэнт ЗША. У час прэзідэнства А. прыняты ў 1798 законы «Аб іншаземцах» і «Аб натуралізацыі» — супраць рэв. эміграцыі з Еўропы.

**А́ДАМС** (Adams) Джон Каўч (5.6.1819—21.1.1892), англійскі астраном. Прэзідэнт Лонданскага астр. т-ва, дырэктар Кембрыджскай астр. абсерваторыі (з 1861). Працы па нябеснай механіцы (асн. з іх — тэарэтычнае вызначэнне векавога паскарэння Месяца). На аснове матэм. аналізу няправільнасцяў у руху планеты Уран незалежна ад У.*Левер'е* ў 1845 адкрыў планету Нептун. Прапанаваў рознасны метад лікавага інтэгравання звычайных дыферэнцыяльных ураўненняў першага парадку.

**А́ДАМС** (Adams) Джон Куінсі (11.7.1767, Куінсі, штат Масачусетс, ЗША — 23.2.1848), дзяржаўны дзеяч ЗША, дыпламат. Сын прэзідэнта Дж.*Адамса*. Першы пасланнік ЗША у Расіі (1809—14), садзейнічаў умацаванню рас.-амер. адносін. У 1815—17 пасланнік ЗША у Англіі. У 1825—29 прэзідэнт ЗША. Адзін з аўтараў *Манро дактрыны*. Выступаў у кангрэсе як прадстаўнік памяркоўнага крыла праціўнікаў рабства.

**А́ДАМС** (Addams) Джэйн (6.9.1860, Седэрвіл, штат Ілінойс, ЗША — 21.5.1935), грамадскі дзеяч ЗША. Дзеяч амер. сац. рэфармізму і міжнар. жаночага руху, пацыфістка. У 1889 заснавала ў Чыкага Хал-хаўс — комплекс сац., культ.-асв. і інш. устаноў для беднякоўімігрантаў. Віцэ-прэзідэнт Амер. асацыяцыі за выбарчае права жанчын (1911—14), старшыня Жаночай партыі міру (з 1915), прэзідэнт Міжнар. жаночай лігі за мір і свабоду (1919—29). Нобелеўская прэмія міру 1931 (разам з Н.*Батлерам*).

А.Адамсан. Апошняе дыханне карабля. 1899.

**А́ДАМС** (Adams) Сэмюэл (27.9.1722, г. Бостан — 2.10.1803), амерыканскі паліт. дзеяч, адзін з арганізатараў вызв. барацьбы ў час *Вайны за незалежнасць у Паўночнай Амерыцы 1775—83*. Кіраваў рэв. арг-цыяй «Сыны свабоды». Заснаваў Карэспандэнцкі к-т у Бостане (1772), на ўзор якога ва ўсіх англ. калоніях былі створаны падобныя рэв. органы ўлады. Выступаў за прыняцце *«Біля аб правах»* і адмену рабства. У 1794—97 губернатар штата Масачусетс.

**А́ДАМСАН** (Adamson) Амандус Генрых (12.11.1855, г. Палдыскі, Эстонія — 26.6.1929), эстонскі скульптар. Вучыўся ў Пецярбургскай АМ (1876—79), акадэмікам якой выбраны ў 1907. У традыцыях рус. рэаліст. скульптуры выкананы найб. вядомыя яго работы: «Апошняе дыханне карабля» (1899), «Русалка» — помнік маракам, што загінулі на браняносцы «Русалка» (1902, Талін), помнік Чарнаморскай эскадры, зато-

Дж.Адамс.

В.У.Адамчык.

пленай у час Крымскай вайны (1905, Севастопаль).

**АДАМСІ́Т**, дыгідрафенарсазінхларыд, $HN(C_6H_4)_2AsCl$, гетэрацыклічнае злучэнне мыш'яку. *Атрутнае рэчыва* слёзатачывага дзеяння. Жоўтыя крышталі, $t_{пл}$ 195 °С. Лятучы, нерастваральны ў вадзе і большасці арган. растваральнікаў, хімічна ўстойлівы. Як хім. зброя ўпершыню выкарыстаны ў 1-ю сусв. вайну.

**АДА́МЧЫК** Вячаслаў Уладзіміравіч (н. 1.11.1933, в. Варакомшчына Дзятлаўскага р-на Гродзенскай вобл.), бел. пісьменнік. Вучыўся ў БДУ (1952—57). Скончыў Вышэйшыя літ. курсы ў Маскве (1965). Працаваў на кінастудыі «Беларусьфільм». З 1982 гал. рэдактар час. «Бярозка». Дэбютаваў вершамі ў 1952. Майстэрства апавядальніка засведчыў кн. «Свой чалавек» (1958), «Млечны шлях» (1960), «Міг бліскавіцы» (1965), «Дзікі голуб» (1972). Лірычнае самавыяўленне асобы з пакалення «дзяцей вайны» саступае месца эпічнаму адлюстраванню жыцця ў Зах. Беларусі. У тэтралогіі з раманаў «Чужая бацькаўшчына» (1977, Літ. прэмія імя І.Мележа 1980), «Год нулявы» (1982), «І скажа той, хто народзіцца» (1985, за гэтыя раманы Дзярж. прэмія Беларусі імя Я.Коласа 1988), «Голас крыві брата твайго» (1990) стварыў вобраз зах.-бел. вёскі ва ўмовах даваен. польскай дзяржавы і ў час змагання з фашызмам. Лёс герояў гэтага нар. эпасу вельмі трагічны: іх імкненне жыць па нормах агульнапрынятай маралі, прага лепшых і найб. здольных быць карыснымі свайму народу ў абставінах, калі нац. ідэя не мае магчымасці вольна развівацца і самасцвярджацца, завяршаецца асабістым паражэннем. Пісьменнік зарэкамендаваў сябе як выдатны псіхолаг,

знаўца чалавечай душы і традыц. вясковага побыту. Маст. канцэпцыя эпохі і гіст. руху народа, зямля якога стала арэнай сутыкнення Захаду і Усходу, утрымлівае многія элементы «новага мыслення» з апорай на нац. і агульначалавечыя каштоўнасці. Аўтар фантаст. аповесці «Падарожжа на Буцафале» (1991), гіст. п'есы «Раіна Грамычына» (1991), сцэнарыяў дакумент. фільмаў «Іван Мележ» (1977), «Валянцін Таўлай» (1978), «Якуб Колас» (1981) і інш.

*Тв.:* Выбр. творы. Т. 1—2. Мн., 1983.

*Літ.:* Л е ц к а Я. Харастваі боль жыцця: Нарыс творчасці Вячаслава Адамчыка. Мн., 1985. *М.А.Тычына.*

**АДА́Н** (Adam) Адольф Шарль (24.7.1803, Парыж — 3.5.1856), французскі кампазітар. Чл. Ін-та Францыі (1844). Скончыў Парыжскую кансерваторыю, з 1849 яе прафесар. У 1839—40 жыў у Пецярбургу. Сцвердзіў рамант. кірунак у франц. балеце («Жызэль, або Вілісы», 1841, «Карсар», 1856, і інш.). У Пецярбургу напісаў балет «Пірат». Аўтар больш як 40 опер, у т.л. «Паштальён з Ланжумо» (1836). Выступаў як муз. крытык. Рымская прэмія 1825.

**А́ДАНА** (Adana), С е й х а н, горад на Пд Турцыі. Адм. ц. іля (адм. адзінка) Адана. Знаходзіцца на раўніне Кілікія на берагах р. Сейхан. 916 тыс. ж. (1990), з прыгарадамі 864 тыс. ж. На чыг. магістралі Стамбул—Багдад. Гандлёва-прамысл. цэнтр баваўнаводчага раёна. С.-г. машынабудаванне, тэкст., харч., тытунёвая, хім., цэментная, дрэваапр. прам-сць. Ун-т.

**АДАНСО́Н** (Adanson) Мішэль (7.4.1727, г. Экс-ан-Праванс, Францыя — 3.8.1806), французскі батанік. Чл. Франц. АН (1759). Даследаваў трапічную Афрыку. Адзін з заснавальнікаў натуральнай сістэмы раслін, варыянт якой выклаў у працы «Сямейства раслін» (1763). У пошуках лагічных высноў класіфікацыі склаў 65 штучных сістэм, параўноўваў іх паміж сабой і па колькасці супадзенняў вызначаў ступень блізкасці супадпарадкаваных груп раслін паміж сабой (упершыню скарыстаў матэм. метады ў біялогіі). Прызнаваў магчымасць зменнасці відаў. З 1772 захапіўся філасофіяй.

*Літ.:* Adanson. The bicentennial of Michel Adanson's Familles des plantes. Pt. 1—2. Pittsburgh, 1963.

**АДАНТАЛО́ГІЯ** [ад грэч. odus (odontos) зуб + *...логія*], раздзел *антрапалогіі*, які вывучае зубную сістэму сучаснага і выкапнёвага чалавека ў эвалюцыйным, анатамічным, расава-генетычным планах і ў сувязі з захворваннямі. На падставе вымярэнняў англ. вучоны У.Флаўэр падзяліў расы на буйназубых (аўстралійцы, тасманійцы), драбназубых (еўрапейцы, індыйцы) і сярэднязубых (кітайцы, амерыканцы, індзейцы, малайцы). Методыка некаторых апісальных прыкмет прапанавана амер. даследчыкам А.Грдлічкам, які адзначыў асаблівасці будовы разцоў у амер. і мангалоіднай расаў. Рас. вучоны А.А.Зубаў удакладніў методыку і прапанаваў адзіную праграму даследаванняў па этнічнай А. для народаў Усх. Еўропы і некат. рэгіёнаў Азіі. У Аддзеле антрапалогіі і экалогіі АН Беларусі сабраны і абагульнены шматлікія даныя аб варыяцыях зубных прыкмет у насельніцтва Беларусі, адзначана іх эпахальная зменлівасць. Метады А. дазваляюць выпрацаваць крытэрыі расавых і ўзроставых адрозненняў, рэканструяваць асн. заканамернасці расагенезу і стараж. міграцый чалавека. *Л.І.Цягака.*

**АДАНТО́МА** [ад грэч. odus (odontos) зуб + *...ома*], дабраякасная пухліна ў выглядзе кангламерату розных зубных тканак. Узнікае ад парушэння развіцця аднаго або некалькіх зубоў на верхняй ці ніжняй сківіцы, часцей каля карэнных зубоў. М я к к а я А. — ранняя стадыя развіцця пухліны — складаецца з эпітэліяльнай і злучальнай тканак. Назіраецца часцей у маладым узросце. Ц в ё р д а я А. (абвапнаваная) можа ўключаць дробныя зубы або зубападобныя структуры, акаймаваныя капсулай. Лячэнне хірургічнае.

**АДАПТАГЕ́НЫ**, лекавыя прэпараты расліннага паходжання, якія павышаюць *адаптацыю* арганізма да неспрыяльных умоў асяроддзя. Да іх належаць прэпараты з *жэньшэню, радыёлы* (залаты корань), *элеўтэракоку* і інш. раслін, якія маюць гліказіды, дубільныя рэчывы, флаваноіды, эфірны алей, арган. к-ты, мікраэлементы і інш. А. здольныя павышаць тонус цэнтр. нерв. сістэмы і працаздольнасць, дзейнасць залоз унутр. сакрэцыі (шчытападобнай, падстраўнікавай, гіпофізу, кары надныракавік), устойлівасць арганізма да інфекц. захворванняў і інш. шкодных уздзеянняў асяроддзя (высокія ці нізкія т-ры, гравітацыйныя перагрузкі, інтаксікацыі прамысл. ядамі, іанізаванае апрамяненне і інш.). Выпускаюцца А. ў выглядзе настояў і вадкіх экстрактаў.

**АДАПТАЦЫ́ЙНАЯ ФІЗІЯЛО́ГІЯ**, раздзел *фізіялогіі*, які даследуе прыроджаныя і набытыя прыстасавальныя рэакцыі розных сістэм жывых арганізмаў на вонкавыя ўздзеянні. Задачы А.ф.: даследаванне фізіял., біяхім. і структурных пераўтварэнняў, якія забяспечваюць адноснае пастаянства ўнутранага асяроддзя арганізма; вывучэнне механізма прыстасавання пры ўздзеянні фактараў навакольнага асяроддзя; вызначэнне гал. дзеючых фактараў і межаў нармальнага рэагавання; распрацоўка шляхоў карэкцыі парушаных функцый і інш. А.ф. вывучае генатыпічную (эвалюцыйную) і фенатыпічную (індывідуальную) *адаптацыі*. Значны ўклад у развіццё А.ф. зрабілі замежныя вучоныя К.Бернар, У.Кенан, Г.Селье, а таксама савецкія Л.А.Арбелі, П.К.Анохін, П.Д.Гарызонтаў, І.В.Давыдоўскі, Ф.З.Меерсон, В.П.Казначэеў, А.Д.Слонім, Ф.І.Фурдуй і інш. На Беларусі праблемы А.ф. вывучаюцца ў ін-тах фізіялогіі, біяхіміі, заалогіі АН Беларусі, мед. ін-тах (Мінск, Віцебск, Гродна). *П.П.Мурзёнак.*

**АДАПТАЦЫ́ЙНЫ СІНДРО́М**, с т р э с, сукупнасць рэакцый жывога арганізма на дзеянне надзвычайных раздражняльнікаў (стрэсараў). Адрозніваюць 3 стадыі: трывогі (мабілізацыя ахоўных сіл арганізма), рэзістэнтнасці або супраціўлення (прыстасаванне да цяжкай сітуацыі), знясілення (пры моцным і доўгім уздзеянні стрэсараў можа скончыцца смерцю). У развіцці А.с. гал. роля належыць пярэдняй долі гіпофіза і кары надныракавік. Змены ў арганізме на стадыі рэзістэнтнасці небяспечныя (напр., павелічэнне артэрыяльнага ціску ў чалавека) і могуць прывесці да інсульту або інфаркту. Канцэпцыя А.с. прапанавана канадскім патолагам Г.Селье (1936).

**АДАПТА́ЦЫЯ** (ад лац. adaptatio прыстасаванне). с а ц ы я л ь н а я, працэс узаемадзеяння індывіда (групы, супольнасці) з сац. асяроддзем. Характарызуецца прыстасаваннем да новых умоў жыцця, выпрацоўкай і актуалізацыяй такіх якасцяў, што забяспечваюць выжыванне, зменай фактараў асяроддзя для найб. поўнага авалодання імі, пераглядам уласных дамаганняў і самаацэнак да рэальных умоў і суб'ектыўных магчымасцяў, пераадоленнем існуючых стэрэатыпаў, звычак, інерцыі мыслення. Чалавек здольны не толькі прыстасоўвацца, але і актыўна ўздзейнічаць на новыя ўмовы і абставіны, кантраляваць і рэгуляваць іх. Працэс А. можа быць татальны пры поўнай змене навакольнага асяроддзя і мэтавы (напр., змена месца работы і інш.). У псіхал. і сац. адносінах важна ўлічваць асаблівасці А. чалавека да працяглага ўздзеяння неспрыяльных фактараў (стрэсараў; гл. таксама *Адаптацыйны сіндром*). А. цесна звязана з асваеннем і прыняццем (інтэрыярызацыяй) індывідам нормаў і каштоўнасцяў таго грамадства, да якога ён належыць, у працэсе *сацыялізацыі*.

*Літ.:* Л е б е д е в В.И. Личность в экстремальных условиях. М., 1989; С в и р и д о в Н.А. Социальная адаптация личности в коллективе // Социол. исслед. 1980. № 3. *С.А.Шавель.*

**АДАПТА́ЦЫЯ** т э к с т у, скарачэнне і спрашчэнне друкаванага тэксту. Найчасцей адаптуюць літ. творы для пач. чытання (кнігі для дзяцей і інш.), а таксама іншамоўныя тэксты, прызначаныя для вывучэння мовы.

**АДАПТА́ЦЫЯ** ў б і я л о г і і, развіццё новых біял. уласцівасцяў арганізма, папуляцыі, віду, біяцэнозу, якія забяспечваюць іх нармальнае існаванне пры змене ўмоў навакольнага асяроддзя. У эвалюцыйна-гіст. плане ўзнікае і развіваецца на базе спадчынных змен (*мутацый*) і камбінавання іх пад кантролем *адбору*. Аснову А. арганізма складае сукупнасць морфафізіял. змен, накірава-

ных на захаванне адноснага пастаянства яго ўнутр. асяроддзя — *гамеастазу*. Сярод шматлікіх формаў А. вылучаюць генатыпічную, якая ажыццяўляецца праз натуральны адбор карысных для выжывання прыкмет, і фенатыпічную (індывідуальную), што праяўляецца пераважна ў колькаснай мадыфікацыі спадчыннa абумоўленых уласцівасцяў.

А. забяспечваецца неспецыфічнымі механізмамі, што ляжаць у аснове *адаптацыйнага сіндрому*, а таксама кампенсатарнымі працэсамі, якія залежаць ад характару патагеннага раздражняльніка. Напр., працэсы акліматызацыі да новых кліматагеагр. умоў, да фону — ахоўная афарбоўка жывёл і інш. Паслядоўныя стадыі А. да пэўнага спосабу жыцця могуць быць звязаны генеалагічна і складаць адаптыўны рад (напр., паступовае развіццё лятальнай перапонкі ў млекакормячых). У працэсе эвалюцыі адбываецца пастаянная змена прыватных А. і намнажэнне агульных (гл. таксама *Адаптыўная радыяцыя*). У арэале віду могуць быць адаптыўныя зоны, якія вызначаюцца спецыфічным характарам прыстасаванасці. Найб. складаныя формы мае *адаптацыя* сацыяльная.

*Літ.:* Структурные основы адаптации и компенсации нарушенных функций. М., 1987; Шмальгаузен И.И. Проблемы дарвинизма. Л., 1969. *А.С.Леанцюк.*

**АДАПТА́ЦЫЯ** ў тэхніцы, здольнасць тэхнічных устройстваў і сістэм прыстасоўвацца да зменлівых умоў навакольнага асяроддзя ці да змен уласнай структуры, што прыводзіць да павышэння эфектыўнасці іх работы. Уласцівая сістэмам аўтам. кіравання, дзе А. дасягаецца за кошт змены параметраў, структуры, алгарытму функцыянавання ў залежнасці ад змены характарыстык знешняга асяроддзя і ўласцівасцяў аб'екта праз назапашванне і выкарыстанне інфармацыі. Найб. эфектыўна рэалізуецца ў мікрапрацэсарных сістэмах кіравання за кошт прымянення алгарытмаў кіравання, пабудаваных на прынцыпах саманастройкі, самаарганізацыі і саманавучання (гл. *Самапрыстасавальныя сістэмы*).

**АДАПТАЦЫЯГЕНЕ́З** (ад *адаптацыя* + *...генез*), адаптагенез, сукупнасць працэсаў узнікнення, развіцця і морфафізіял. пераўтварэнняў, якія забяспечваюць прыстасаванне (адаптацыю) арганізмаў у працэсе эвалюцыі арган. свету. У вузкім сэнсе А. — узнікненне адаптацый, а працэс развіцця і змены прыстасаванняў у працэсе індывід. жыцця арганізмаў і папуляцый наз. адаптацыямарфозам (тэрмін уведзены рус. біёлагам І.І.Шмальгаўзенам, 1939). А. звязаны са спадчыннасцю і зменлівасцю. Новыя прыстасаванні фарміруюцца ў выніку выжывання найб. прыстасаваных да існуючых умоў асяроддзя арганізмаў. У працэсе эвалюцыі адны прыстасаванні трацяць сваё значэнне і знікаюць, другія распаўсюджваюцца і робяцца характэрнымі для дадзенай групы арганізмаў. Вылучаюць 2 асн. шляхі адаптыўных пераўтварэнняў групы: павышэнне (або рэзкія змены) узроўню арганізацыі (*арамарфоз*) і развіццё без змен узроўню арганізацыі (*ідыяадаптацыя, кладагенез, адаптыўная радыяцыя*). *А.С.Леанцюк.*

**АДАПТАЦЫЯМАРФО́З**, гл. ў арт. *Адаптацыягенез.*

**АДАПТО́МЕТР** (ад *адаптацыя* + *...метр*), аптычная прылада для вызначэння адаптацыі вока: змены яго святлоадчувальнасці пры пераходзе ад вял. асветленасці паверхні ці яркасці аб'екта да цемнаты. А. вымяраюць парог (мінім. сілу) светлавога раздражнення, якое ўспрымаецца вокам.

**АДАПТЫ́ЎНАЯ ЗО́НА**, узаемазвязаны комплекс умоў, які забяспечвае спецыфічныя геафіз. і экалагічныя патрэбнасці існавання жывёльных і раслінных арганізмаў і гэтым вызначае тып *адаптацыі* вял. груп у працэсе *макраэвалюцыі*. Характарызуе стан прыстасаванасці арганізмаў да адаптыўнага ландшафту і біягеацэнозу. Тэрмін увёў амер. біёлаг Дж.Сімпсан (1944). Арган. свет можна разглядаць як сістэму шырокіх або вузкіх А.з., падобных у асн. рысах будовай экалагічна блізкіх форм, якія насяляюць іх і адпавядаюць умовам асяроддзя. Услед за засяленнем новай А.з. звычайна адбываецца *адаптыўная радыяцыя*.

**АДАПТЫ́ЎНАЯ РАДЫЯ́ЦЫЯ**, тып эвалюцыі, пры якім ад адной продкавай формы ўтвараецца мноства разнастайных формаў арганізмаў у межах віду або групы роднасных відаў. Ляжыць у аснове *адаптацыягенезу* і з'яўляецца вынікам набыцця арганізмам прыстасаванасці (гл. *Адаптацыя* ў біялогіі) і пранікнення ў новыя *адаптыўныя зоны*. Праяўляецца ў разнастайнасці падпарадкаваных таксанамічных груп у межах кожнага буйнога таксона (напр., розныя віды грызуноў — вавёркі, суслікі, бабры, сям. драпежных млекакормячых і інш.). Канцэпцыя А.р. сфармулявана амер. вучоным Г.Осбарнам у сувязі з эвалюцыяй млекакормячых (1910).

Осбарн адрозніваў 5 гал. ліній спецыялізацыі ў будове канечнасцяў млекакормячых, залежных ад умоў месцазнаходжання і спосабаў перамяшчэння: хуткі бег у наземных відаў; рыючы лад жыцця ў відаў, якія жывуць пад зямлёй; плаванне ў відаў, што жывуць у вадзе; лажанне ў дрэвавых відаў; планіраванне і палёт у відаў, жыццё якіх праходзіць у паветры. Асн. крыніца А.р. — унутрывідавыя працэсы (генетычная разнастайнасць відавых папуляцый, дыферэнцыроўка віду на геагр. і




**Схема асноўных рэакцый і вынікаў адаптацыйнага сіндрому.**

экалагічныя расы і інш.). Наяўнасць у продкавага арганізма якой-небудзь структуры або фізіял. функцыі, што ў вельмі мадыфікаванай форме ёсць у больш высокаразвітых родасных арганізмаў, сведчыць пра іх агульнае паходжанне і складае аснову эвалюц. тэорыі (гл. *Філагенез*). *А.С.Леанцюк.*

**АДАПТЫЎНЫ РО́БАТ**, гл. *Самапрыстасавальны робат.*

**АДАПТЫЎНЫЯ ТЫ́ПЫ**, папуляцыі чалавека, аб'яднаныя фізіялагічнымі і марфалагічнымі адзнакамі, сфарміраванымі ў залежнасці ад геакліматычных умоў. У розных кліматычных зонах у людзей незалежна ад іх расавай і этн. прыналежнасці назіраецца тэндэнцыя да змены фізіял. і марфалаг. рысаў у кірунку, найб. спрыяльным для існавання ў гэтым асяроддзі. Напр., у арктычных умовах адзначаецца павышанае развіццё мускулатуры, мінералізацыя касцяка, павелічэнне колькасці бялку ў сываратцы крыві, змена ахоўных уласцівасцяў арганізма (паскарэнне рэакцыі асядання эрытрацытаў, нейтрафілёз, павелічэнне гамаглабулінавых фракцый сываратцы крыві). Паводле асаблівасцяў адаптыўных рэакцый вылучаюць арктычны, кантынентальны, трапічны, высакагорны тыпы, тып сярэдняй зоны, арыдны (тып пустыні). Вывучэнне біял. адаптацыі і А.т. спрыяе высвятленню працэсу расаўтварэння.

*Літ.:* Алексеева Т.И. Адаптивные процессы в популяциях человека. М., 1986; Тегако Л.И., Саливон И.И. Экологические аспекты в антропологических исследованиях на территории БССР. Мн., 1982.

*Л.І.Цягака.*

**АДА́ПТЭР**, 1) у вылічальнай тэхніцы электроннае прыстасаванне для ўзгаднення параметраў уваходных і выхадных сігналаў *працэсара* ЭВМ і перыферыйных прылад з мэтай іх спалучэння. Напр., А. падтрымкі клавіятуры, дысплея, друкавальнага прыстасавання. 2) У фатаграфіі прыстасаванне для спалучэння фотаапарата са зменным абсталяваннем, якое не прадугледжана канструкцыяй гэтага апарата, напр. аб'ектыва, дадатковай зменнай касеты са святлоадчувальным матэрыялам інш. фармату. 3) У радыётэхніцы тое, што *гуказдымальнік.*

**АДА́РЧАНКА** Анатоль Арсеньевіч (н. 20.9.1949, г.п. Старобін Салігорскага р-на Мінскай вобл.), бел. медык-мікрабіёлаг. Д-р мед. н. (1991), праф. (1994). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1972), з 1975 у гэтым ін-це. Навук. працы па этыялогіі, экалогіі і эвалюцыі ўнутрыбальнічных інфекцый у хірург. і апёкавых аддзяленнях; распрацаваў і ўкараніў новыя метады мікрабіял. дыягностыкі, тэрапіі і прафілактыкі гнойна-септычных захворванняў.

*Тв.:* Handbuch der Antiseptik. Bd. 1—20. Berlin, 1984—89 (у сааўт.).

**АДАСО́БЛЕНАЯ ХВА́ЛЯ**, тое, што *салітон.*

**АДАСО́БЛЕНЫЯ ЧЛЕ́НЫ СКА́ЗА**, залежныя кампаненты, якія інтанацыйна і сэнсава выдзяляюцца ў сказе, каб надаць ім большае значэнне і павысіць камунікатыўную дзейнасць. Вызначаюцца немагчымасцю сінтаксічнай спалучальнасці з інш. членамі сказа, не аб'ядноўваюцца з імі ў словазлучэнні, аддзяляюцца ад іх працяглай паўзай, маюць сінтагматычны націск, аслабленую ці ўзмоцненую інтэнсіўнасць маўлення. Адносна свабодна размяшчаюцца ў структуры сказа і на пісьме выдзяляюцца коскай ці працяжнікам.

А.ч.с. могуць быць дапасаваныя і недапасаваныя азначэнні («Неба, **зацягнутае шэрымі хмарамі**, нізка навісла над лесам», У.Карпаў, «Быў у замку дзед Даніла, **родам дзесь з-пад Мазыра**», Я.Колас), прыдаткі («Салавей, **пясняр крылаты**, прыляцеў вясной дахаты», Я.Пушча), дапаўненні (**«Замест цёмнай нуднай ночы** — Ясны дзень даўно настаў», У.Хадыка), акалічнасці («Добра ў садзе

Адаптыўная радыяцыя плацэнтарных млекакормячых, якія маюць агульнага продка (у цэнтры).

хадзіць, **сустракаючы сонечны ранак**», П.Панчанка). Утвараюць сінтаксічна непадзельныя канструкцыі, якія заключаюць у сабе адпаведнае сцвярджэнне ці адмаўленне і выконваюць паўпрэдыкатыўную функцыю («Ужо не вернецца ніколі краса, **адцвіўшая даўно**», П.Трус) або служаць для канкрэтызацыі асобных словаформаў, выконваючы ўдакладняльна-паясняльную (непрэдыкатыўную) функцыю («Там, **далёка, за дамамі**, разляглося поле», Я.Колас). *Л.І.Бурак.*

**АДА́Т** (араб. звычай), звычаёвае права ў некаторых мусульманскіх народаў. Склаўся пры родаплемянных адносінах. Прызнае кроўную помсту, выкраданне нявест, мнагажонства, цялеснае пакаранне і інш.

**АДА́ХАЎШЧЫНА**, вёска ў Беларусі, у Навасёлкаўскім с/с Ляхавіцкага р-на Брэсцкай вобл., на р. Шчара. Цэнтр калгаса «Адахаўшчына». За 23 км на Пн ад г. Ляхавічы, 211 км ад Брэста, 10 км ад чыг. ст. Баранавічы. 267 ж., 102 двары (1995). Цэхі па вырабе скур, швейны, сталярны. Школа-сад, клуб, бібліятэка.

**АДАХО́ЎСКІ** Хрыстафор (? — 1661), ваенны дзеяч ВКЛ. Палкоўнік. Служыў у гусарскай харугве Х.Паца (1648). За свой кошт сфарміраваў харугву лёгкай кавалерыі, на чале якой змагаўся са шведамі ў Жамойці, Інфлянтах і Курляндыі (1655—60). У час *вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67* камандаваў палком, у 1660—61 на чале 15 харугваў удзельнічаў у баях супраць войска Далгарукага на тэр. Беларусі. Удзельнік канфедэрацыі супраць караля Яна II Казіміра, бітвы пад Кушлікамі 1661. Выступіў прыхільнікам замірэння з каралём. Загінуў у час узбр. сутычкі сярод канфедэратаў. *П.Р.Казлоўскі.*

**АДА́ШАЎ** Аляксей Фёдаравіч (1530 ? — 1561), расійскі дзярж. дзеяч, дыпламат. З канца 1540-х г. адзін з кіраўнікоў *Выбранай рады.* У 1550-я г. даверараная асоба цара Івана IV Грознага, кіраваў унутр. і знешняй палітыкай дзяржавы. Пры ўдзеле А. да Расіі далучаны Казанскае (1552) і Астраханскае (1556) ханствы. У 1560 пасланы ваяводам у Лівонію. Прыхільнік экспансіі на У і Пд, А. быў супраць актывізацыі *Лівонскай вайны 1558—83.* Трапіў у няміласць да цара, зняволены ў Юр'еве (цяпер Тарту), дзе і памёр.

**АДБЕ́ЛЬВАННЕ**, бяленне, тэхналагічны працэс выдалення дамешкаў і знішчэння непажаданай натуральнай афарбоўкі матэрыялаў (натуральных і штучных валокнаў, паперы, воску, скуры, футра, пластычных мас і інш.) для надання ім белага колеру ці перад фарбаваннем. Хімічнае А. ўключае папярэднюю апрацоўку матэрыялу хлорамінам, слабымі растворамі кіслот і шчолачаў або ферментатыўнымі прэпаратамі і наступнае ўздзеянне акісляльнікаў (гіпахларыту натрыю ці кальцыю, пераксіду вадароду, хларыту натрыю, перманганату калію) ці аднаўляльнікаў (сярністага газу, гідрасульфіту ці бісульфіту натрыю). Аптычнае А. заснавана на дзеянні бясколерных флуарэсцыруючых арган. рэчываў — белафараў (вытворных стыльбену, аксазолу, імідазолу), якія ператвараюць УФ-выпрамяненне дзённага (сонечнага) святла ў сіне-фіялетавы колер бачнага святла і такім чынам кампенсуюць паглынанне святла забруджваннямі. Матэрыялы пры гэтым набываюць высокую ступень белізны, фарбаваныя — яркасць і кантрастнасць. Фатаграфічнае А. — прамежкавая стадыя апрацоўкі каляровых і чорна-белых кіна- і фатаграфічных матэрыялаў, у выніку якой адбываецца акісленне метал. серабра відарыса акісляльнікамі (чырв. крывяная соль, біхромат калію і інш.) у злучэнні белага колеру, што выдаляюцца пры далейшай апрацоўцы.

**АДБЕ́ЛЬНЫЯ ГЛІ́НЫ**, гліністыя горныя пароды з рэзка выражанымі ўласцівасцямі *адсорбцыі.* У мінулым шырока выкарыстоўваліся для адбельвання сукна (адсюль назва). Ачышчаюць розныя рэчывы (пераважна вадкасці) ад пігментаў, муці, смолаў, слізі і інш. прымесяў. Складаюцца ў асноў-

ным з *мантамарыланіту*, *сапаніту* і інш. мінералаў. Трапляюцца пераважна ў адкладах мелавога, палеагенавага і неагенавага перыядаў, у месцах вулканічнай актыўнасці. Выкарыстоўваюць пры ачыстцы нафты і нафтапрадуктаў, алею, тлушчаў, сокаў, воцату, вінаў і інш. Як адсарбенты прыдатныя актывізаваныя стужкавыя гліны, якімі багатыя Віцебскі, Полацкі, Петрыкаўскі р-ны Беларусі.

**АДБІВА́ЛЬНАЯ ПЕЧ**, полымная плавільная печ, у якой цеплыня перадаецца матэрыялу ад газападобных прадуктаў згарання паліва і выпрамянення ўнутранай паверхні гарачай вогнетрывалай абмуроўкі.

У бесперапынных А.п. загрузка *шыхты* і выгрузка гатовых прадуктаў плаўкі ідуць на працягу ўсяго працэсу работы печы (напр., у выт-сці шкла, пры рафінаванні свінцу). У садачных А.п. шыхта загружаецца перыядычна, па заканчэнні працэсу ўся плаўка выгружаецца з печы (напр., выплаўка сталі ў *мартэнаўскіх печах*). Выкарыстоўваецца ў чорнай і каляровай металургіі, выт-сці шкла і інш.

**АДБІ́ТАК**, адлюстраванне тэксту, графічнай інфармацыі на паперы, кардоне і інш. матэрыяле, атрыманае з друкарскай формы. Адрозніваюць А. пробныя (для кантролю якасці) і тыражныя (прадукцыя, якая атрымліваецца з друкарскай машыны). Параўн. *копія*.

**АДБІ́ТКІ** раслін і жывёл, выкапнёвыя сляды існавання раслін і жывёл у слаях асадкавых парод, від *акамянеласцяў*. Звычайна ў выкапнёвым стане захоўваюцца А. лісця, ствалоў, пладоў і інш. частак раслін, шкілетаў, панцыраў, радзей цэлых жывёлін. Утварыліся з рэшткаў пахаваных у асадках вадаёмаў і мінер. крыніц, дзюнных пясках, вулканічных туфах і магмах, каменным вугалі.

Бываюць афарбаваныя вокісламі жалеза або марганцу, часам пакрыты вуглістай, крамянёвай або жалезістай плёнкай. На Беларусі А. раслін трапляюцца ў адкладах усіх раздзелаў фанерозою ў выглядзе А. лісця, пустот ад драўніны, шышак, пладоў, злепкаў дзеразападобных, членістасцябловых, папарацепадобных, рызоідаў, стыгмарыяў, А. жывёл — у адкладах ад ардовіку да галацэну: трылабіты, губкі, каралы, ракападобныя, астракоды, малюскі, імшанкі, рыбы і інш. жывёлы. А. раслін даследуе *палеабатаніка*, А. жывёл — *палеазаалогія*.

**АДБІЦЦЁ СВЯТЛА́**, частковае ці поўнае вяртанне ў першае асяроддзе светлавога патоку, які падае на мяжу двух асяроддзяў з рознымі паказчыкамі пераламлення. Адбівальная здольнасць цела залежыць ад аптычных уласцівасцяў сумежных рэчываў, даўж. хвалі $\lambda$ святла, якое падае, і якасці адбівальнай паверхні.

Калі няроўнасці паверхні падзелу меншыя за $\lambda$, наглядаецца люстраное А.с. Пры гэтым выконваюцца 2 законы А.с.: адбіты прамень S′ ляжыць у адной плоскасці з праменем S, што падае, і перпендыкулярам ON да адбівальнай паверхні ў пункце падзення; вугал адбіцця Z′ роўны вуглу падзення $\alpha$ (рыс. 1). Калі няроўнасці адбівальнай паверхні большыя за $\lambda$, святло адбіваецца па ўсіх напрамках у межах паўсферы — дыфузнае адбіццё (рыс. 2). У 1954 Ф.І.*Фёдаравым* адкрыта з'ява перпендыкулярнага да плоскасці падзення зруху адбітага пучка святла (гл. *Фёдарава зрух*). Асобны выпадак А.с. — *поўнае ўнутранае адбіццё*. Памяншэнне А.с. дасягаецца *прасвятленнем оптыкі*; для павелічэння адбіцця на люстраныя паверхні наносяць метал. дыэлектрычныя пакрыцці. Гл. таксама *Пераламленне святла*.

**АДБІЦЦЁ ХВА́ЛЯЎ**, перавыпрамяненне хваляў перашкодамі са зменай напрамку іх распаўсюджвання. Адбываецца на непразрыстых целах, у якіх хвалі такой прыроды не распаўсюджваюцца, і неаднароднасцях асяроддзяў. Звычайна на мяжы падзелу асяроддзяў з рознымі ўласцівасцямі разам з А.х. адбываецца і *пераламленне хваляў*. Інтэнсіўнасць адбітай хвалі характарызуецца каэфіцыентам адбіцця, які залежыць ад прыроды хваляў і іх палярызацыі, уласцівасцяў асяроддзяў, вугла падзення і роўны адносіне патокаў энергіі адбітай



Да арт. **Адбіткі** раслін і жывёл: 1 — адбітак папараці з ніжнята мелу; 2 — маладыя і дарослыя трылабіты з кембрыйскіх адкладаў Сібіры.

1 2

хвалі і той, што падае. Пры люстраным А.х. на плоскіх межах падзелу выконваюцца законы, якія супадаюць з законамі *адбіцця святла*.

**АДБО́ЙНІК**, каменная прылада, з дапамогай якой у старажытнасці расколвалі крэмень, счэсвалі з яго жаўлаковую скарынку, рабілі *нуклеусы*, адбівалі *адшчэпы*. У палеаліце як А. выкарыстоўвалі рачную гальку ці жаўлакі крэменю. У неаліце паявіліся А. з дзяржаннем, зробленым аббіваннем крамянёвага жаўлака.

**АДБО́ЙНЫ МАЛАТО́К**, ручны інструмент ударнага дзеяння, якім адбіваюць горныя пароды ад масіву, рыхляць цвёрдыя і мёрзлыя грунты, разбіваюць каменную або цагляную муроўку, асфальт і г.д. Рабочы орган — піка, долата або рыдлёўка, па хваставой частцы якіх (звычайна з частатой 1000—1500 удараў за мінуту) б'е баёк. Бываюць




**Адбіццё святла:** 1 — люстраное; 2 — дыфузнае.

пнеўматычныя (сціснутае паветра падаецца ад кампрэсараў, балонаў і інш.), электрычныя і бензінавыя (з прыводам ад рухавіка ўнутр. згарання).

**АДБО́Р** у біялогіі, працэс дыферэнцыраванага ўзнаўлення *генатыпаў* у папуляцыі; вядучы фактар *эвалюцыі*. Дзейнічае на фоне генатыпічнай зменлівасці. Адрозніваюць А. у прыродзе — *натуральны адбор* і А., які праводзіцца чалавекам, — *штучны адбор*.

**АДБО́РУ ПРА́ВІЛЫ** ў фізіцы, умовы, што вызначаюць магчымасць пераходу квантавых сістэм (ядраў, атамаў, малекул і інш.) з пачатковага стану ў канчатковы пры фіз. працэсах, звязаных з выпрамяненнем і паглынаннем энергіі.

А.п. выражаюць выкананне пэўных *захаванняў законаў* у дадзеным працэсе і фармулююцца ў выглядзе суадносін паміж *квантавымі лікамі*. Аснова тэарэт. вызначэння А.п. — патрабаванне адрознення ад нуля імавернасці пераходу паміж пач. і канчатковым станамі сістэмы, напр., імавернасць дыпольных пераходаў, звязаных з выпрамяненнем святла атамам, адрозніваецца ад нуля пры змене квантавых лікаў: $\Delta L = \pm 1$, $\Delta s = 0$, $\Delta I = 0$ або $\pm 1$ (за выключэннем, калі $I = 0$ у пач. і канчатковым станах), дзе I, L і s — адпаведна квантавыя лікі поўнага моманту імпульсу электроннай абалонкі, арбітальнага моманту і агульнага спінавага моманту электронаў. Пераходы, якія падпарадкоўваюцца А.п. дыпольнага выпрамянення, наз. дазволенымі, у адваротным выпадку — забароненымі (іх імавернасць у атамах вельмі малая). Адпаведныя А.п. існуюць у ядз. спектраскапіі і фізіцы элементарных часціц. *Л.М.Тамільчык.*

**АДВА́ЖНЫ** Вінцук (сапр. Германовіч Язэп Станіслававіч; 4.3.1890, в. Гальшаны Ашмянскага р-на Гродзенскай вобл. — 26.12.1978), бел. пісьменнік. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю (1913). Служыў ксяндзом. За азанні на бел. мове зазнаў ганенні польскіх улад. У 1924 у Друі ўступіў у ордэн марыянаў. У 1932 выехаў у Харбін (Кітай), у 1936 вярнуўся ў Вільню, адтуль выселены ў Польшчу, потым зноў выехаў у Харбін. У 1948 арыштаваны кіт. ўладамі і перададзены ў СССР, дзе беспадстаўна асуджаны на

25 гадоў. Вызвалены ў 1955, выехаў у Польшчу, потым у Італію, Англію, дзе рэдагаваў час. «Божым шляхам». Друкаваўся з 1917. Празаічная гутарка «Як Казюк сабраўся да споведзі» (1928) пра маральнае самаўдасканаленне зах.-бел. моладзі. Самадурства чыноўнікаў выкрыў у вершаваным апавяданні «Як Гануля збіралася ў Аргентыну» (1930). Аўтар зб-каў вершаў «Беларускія цымбалы» (Вільня, 1933), «Байкі і іншыя вершы» (Лондан, 1973) і інш., аповесці «Хлопец» (Вільня, 1935), успамінаў «Кітай—Сібір—Масква» (Мюнхен, 1962).

В.Адважны.

**АДВАКА́Т** (лац. advocatus), асоба, якая аказвае юрыд. дапамогу грамадзянам, прадпрыемствам, установам і арг-цыям, выступае ў якасці абаронца абвінавачанага на следстве і ў судзе. На Беларусі А. можа быць грамадзянін, які мае вышэйшую юрыд. адукацыю, стаж работы па спецыяльнасці не менш як 3 гады або прайшоў стажыроўку ў адвакатуры, здаў кваліфікацыйны экзамен і атрымаў ліцэнзію на права займацца адвакацкай дзейнасцю. Прафесія вядома на Беларусі з 16 ст. Функцыі А. ў судах выконваў прокурат ар, правы і абавязкі якога былі рэгламентаваны Статутам ВКЛ 1588. Гл. таксама *Адвакатура*.

*І.І.Пацяружа.*

**АДВАКАТУ́РА**, добраахвотнае аб'яднанне *адвакатаў*; незалежны прававы інстытут, гал. задача якога — аказанне кваліфікаванай юрыд. дапамогі фіз. і юрыд. асобам пры абароне іх правоў, свабод і законных інтарэсаў.

У Расіі А. заснавана ў час правядзення суд. рэформы 1864 і складалася з самакіроўных арг-цый прысяжных павераных пры суд. палатах. Ліквідавана ў ліст. 1917, адноўлена ў 1922. У БССР створана ў чэрв. 1922 як грамадская арг-цыя для юрыд. дапамогі насельніцтву, дзярж. і кааператыўным арг-цыям.

Дзейнасць А. на Беларусі рэгулюецца Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, Законам «Аб адвакатуры» ад 15.6.1993 і інш. нарматыўнымі актамі. Адвакаты працуюць калегіяльна (калегіі, фірмы, бюро, канторы) і індывідуальна. Дзейнічаюць абласныя і Мінская гар. калегіі адвакатаў. Для аказання юрыд. дапамогі калегіямі адвакатаў па ўзгадненні з выканаўчымі органамі мясц. улады ствараюцца юрыд. кансультацыі. Статус юрыд. кансультацый вызначаецца адпаведнымі калегіямі адвакатаў. Статуты калегій адвакатаў, інш. адвакацкіх аб'яднанняў рэгіструюцца ў Мін-ве юстыцыі.

*І.І.Пацяружа.*

**АДВА́Л**, насып з глебы, пород і адходаў, утвораны ў выніку раскрыўных ці інш. адвальных работ пры распрацоўцы карысных выкапняў, буд-ве каналаў і інш. Можа займаць спец. адведзеныя пляцоўкі ці адмоўныя формы рэльефу (яры, лагчыны і інш.). Пасля распрацоўкі радовішчаў або заканчэння інш. работ павінны знішчацца ці праходзіць стадыю *рэкультывацыі* ў прыродаахоўных мэтах.

**АДВАРО́ТНАЯ МА́ТРЫЦА** квадратнай матрыцы A, *матрыца* B таго ж парадку, вызначаная так, што AB = BA = E, дзе E — адзінкавая матрыца. Існуе тады і толькі тады, калі *дэтэрмінант* |A| матрыцы A не роўны нулю, у гэтым выпадку А.м. адзіная і яе элементы $b_{ij}$ знаходзяць па формуле

Графікі ўзаемна адваротных функцый y = f(x) і y = F(x)

$b_{ij} = (-1)^{j+i} M_{ji}|A|$, дзе $M_{ji}$ — дадатковы *мінор* элемента $a_{ji}$ матрыцы A.

**АДВАРО́ТНАЯ СІ́ЛА ЗАКО́НУ**, пашырэнне дзеяння закону на факты і юрыд. вынікі, якія ўзніклі да набыцця ім сілы. У бел. праве паводле агульнага правіла закон адваротнай сілы не мае. Выключэнне складае крымін. закон, нормы якога ўстараняюць наогул пакаранне за адпаведнае дзеянне (бяздзеянне) ці змякчаюць пакаранне ў параўнанні з раней дзеючым законам.

**АДВАРО́ТНАЯ СУ́ВЯЗЬ**, уздзеянне вынікаў функцыянавання якой-небудзь сістэмы (аб'екта) на характар гэтага функцыянавання. Характарызуе сістэмы рэгулявання і кіравання ў жывой прыродзе, грамадстве і тэхніцы, выяўляе накіраванасць узаемадзеяння пры пераносе рэчыва, энергіі, інфармацыі. Адно з паняццяў, што выкарыстоўваецца ў замкнутых сістэмах кіравання рознай фіз. прыроды (біял., тэхн., эканам., сац.), у якіх адхіленні сістэмы ад пэўнага стану служаць для фарміравання кіроўных уздзеянняў на працэс далейшага функцыянавання сістэмы. Адмоўная А.с. змяншае вынікі адхілення сістэмы ад першапачатковага стану, напр. павышае стабільнасць каэфіцыента ўзмацнення і памяншае нелінейныя скажэнні электроннага ўзмацняльніка. Дадатная А.с. звычайна прыводзіць да няўстойлівай работы сістэмы ў цэлым, выклікае лавінны працэс; выкарыстоўваецца, напр., у радыётэхніцы для стварэння аўтавагальных сістэм генератараў гарманічных і рэлаксацыйных ваганняў. У залежнасці ад характару сувязі паміж сістэмай і органам кіравання бывае бесперапынная, дыскрэтная (эпізадычная); статычная (жорсткая), дынамічная (гнуткая); лінейная або нелінейная А.с. У складаных сістэмах (напр., у сац., біялагічных) вызначыць тып А.с. вельмі цяжка, а то і немагчыма. Часам А.с. у такіх сістэмах разглядаюць як перадачу інфармацыі аб працяканні працэсу, на аснове якой выпрацоўваецца тое ці інш. ўздзеянне. У гэтым выпадку А.с. называюць інфармацыйнай. Прынцып А.с. найбольш распрацаваны ў *кібернетыцы, аўтаматычнага кіравання тэорыі, радыёэлектроніцы*. У біял. сістэмах А.с. ажыццяўляецца ад клеткі да цэласнага арганізма. Звычайна накіравана на падтрымліванне пастаянства асн. параметраў жыццядзейнасці, рэчыўных і энергет. затрат пры ўзаемадзеянні з навакольным асяроддзем.

**АДВАРО́ТНАЯ ТЭАРЭ́МА**, тэарэма, умовай якой з'яўляецца выснова зыходнай (прамой) тэарэмы, а высновай — умова. Прамая і А.т. — узаемна адваротныя. З іх праўдзівасці вынікае, што выкананне ўмовы адной з іх не толькі дастаткова, але і неабходна для праўдзівасці высновы, напр., тэарэмы: «калі 2 вуглы трохвугольніка роўныя, то іх бісектрысы роўныя» і «калі 2 бісектрысы трохвугольніка роўныя, то адпаведныя ім вуглы роўныя», — узаемна адваротныя і абедзве праўдзівыя. З праўдзівасці якой-н. тэарэмы не вынікае праўдзівасць А.т. да яе, напр., тэарэма: «калі лік дзеліцца на 6, то ён дзеліцца на 3» — праўдзівая, а А.т.: «калі лік дзеліцца на 3, то ён дзеліцца на 6» — непраўдзівая.

**АДВАРО́ТНАЯ ФУ́НКЦЫЯ** да функцыі y=f(x), функцыя x=φ(y), што атрымліваецца з зададзенай функцыі f(x), калі з ўраўнення f(x)=y выразіць x праз y. Напр., $x = \ln y$ — А.ф. для $y = e^x$, $x = +\sqrt{y}$ — для $y = x^2 (x \geq 0)$. Функцыі y = f(x) і x = φ(y) наз. ўзаемна адваротнымі. Вобласць вызначэння адной з дзвюх такіх функцый з'яўляецца вобласцю значэнняў другой і наадварот. Графікі ўзаемна А.ф. сіметрычныя адносна бісектрысы першага і трэцяга каардынатных вуглоў.

**АДВАРО́ТНЫ ЛІК**, лік, здабытак якога з дадзеным лікам роўны адзінцы. Два

такія лікі наз. ўзаемна адваротнымі, напр. 5 і 1/5, 2/3 і 3/2 і г.д. Для кожнага ліку a, не роўнага 0, існуе А.л. 1/a.

**АДВАРО́ТНЫ О́СМАС**, гіперфільтрацыя, метад раздзялення растораў пад ціскам ад 3 да 8 МПа. Адбываецца ў апаратах з раздзяляльнымі паўпранікальнымі мембранамі з палімерных плёнак ці полых валокнаў, якія цалкам ці часткова затрымліваюць растворанае рэчыва і прапускаюць растваральнік (звычайна ваду). Эфектыўнасць А.о. вызначаецца селектыўнасцю і пранікальнасцю мембраны. Выкарыстоўваецца для апраснення салёных і ачысткі сцёкавых водаў, раздзялення азеатропных сумесяў, канцэнтравання растораў, асвятлення і ачысткі харч. прадуктаў.

**АДВАРО́ТНЫ СЛО́ЎНІК**, інверсійны слоўнік, тып лінгвістычнага даведніка, у якім рэестравыя словы размяшчаюцца ў алфавітным парадку з улікам іх палітарнага прачытання справа налева, а не злева направа, як у звычайных алфавітных слоўніках. Рэестравыя адзінкі А.с. выраўноўваюцца ў наборы па правым краі:

*самба*
*бомба*
*пломба*
*клумба* і г.д.

Побач размяшчаюцца словы з аднолькавымі канчаткамі і суфіксамі, што дазваляе высвятляць словаўтваральную і марфемную структуру слова, вызначаць тып словазмянення рэестравай адзінкі, выяўляць прадукцыйнасць пэўнага словаўтваральнага тыпу, распрацоўваць *рыфмаў слоўнікі* і інш. А.с. падзяляюцца на слоўнікі-індэксы і слоўнікі з самаст. рэестрамі. А.с. створаны больш чым для 30 моў. На матэрыяле бел. мовы распрацаваны: А.с. мікратапонімаў (змешчаны ў слоўніку «Мікратапанімія Беларусі», 1974), «Адваротны слоўнік сучаснай беларускай мовы» А.Барташэвіча і І.Камендацкай (т. 1—4, 1988—89), які падае каля 100 тыс. слоў з акад. «Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы» (т. 1—5, 1977—84); «Адваротны слоўнік беларускай мовы» Л.М.Вардамацкага і В.І.Несцяровіча (1994). *В.К.Шчэрбін.*

**АДВАРО́ТНЫХ АДНО́СІН ЗАКО́Н**, фіксуе залежнасць паміж аб'ёмам і зместам паняццяў: чым шырэйшы аб'ём паняцця, тым вузейшы яго змест, і наадварот. Калі аб'ём аднаго паняцця складае частку аб'ёму другога, то для іх зместу ўласцівыя адваротныя адносіны. Прынята лічыць, што першае вызначэнне гэтага закону належыць логікам Пор-Раяля (1660-я г.), але найб. вядомая фармулёўка дадзена І.Кантам. А.а.з. дае магчымасць тлумачыць лагічныя аперацыі абагульнення і абмежавання паняццяў. Калі ідуць ад паняццяў меншага аб'ёму да паняццяў большага аб'ёму, то за кошт звужэння зместу адбываецца іх абагульненне, калі ж ад паняццяў большага да меншага, то з-за пашырэння зместу адбываецца абмежаванне. *У.Ф.Бяркоў.*

**АДВАРО́ТНЫЯ ТРЫГАНАМЕТРЫ́ЧНЫЯ ФУ́НКЦЫІ**, кругавыя функцыі, функцыі, якія вызначаюць дугу (лік) па дадзеным значэнні яе *трыганаметрычных функцый*, што разглядаюцца на пэўных прамежках манатоннасці.

Адрозніваюць Arcsin x («арксінус x») — мноства функцый, адваротных да sin x; Arccos x («арккосінус x») — да cos x; Arctg x («арктангенс x») — да tg x; Arcctg x («арккатангенс x») — да ctg x; Arcsec x («арксеканс x») да sec x; Arccosec x («арккасеканс x») — да cosec x. Функцыі Arcsin x і Arccos x вызначаны пры $|x| \le 1$, Arctg x і Arccotg x — для ўсіх сапраўдных x, Arcsec x і Arccosec x — $|x| \ge 1$ (2 апошнія выкарыстоўваюцца рэдка). У выніку перыядычнасці трыганаметрычных функцый для кожнай з іх існуе бесканечнае мноства адваротных функцый, гал. значэнні якіх вызначаюцца ўмовамі: $-\pi/2 \le \arcsin x \le \pi/2$; $0 \le \operatorname{arccos} x \le \pi$; $-\pi/2 \le \operatorname{arctg} x \le \pi/2$; $0 \le \operatorname{arsec} x \le \pi$; $0 \le \operatorname{arcctg} x \le \pi$; $-\pi/2 \le \operatorname{arccosec} x \le \pi/2$. Суадносіны паміж трыганаметрычнымі функцыямі можна замяніць суадносінамі паміж А.т.ф., напр., з роўнасці $\operatorname{tg} x = \frac{\sin x}{\sqrt{1-\sin^2 x}}$ вынікае, што $\arcsin x = \operatorname{arctg} \frac{x}{\sqrt{1-x^2}}$.



Графікі **адваротных трыганаметрычных функцый**: 1 — арксінуса; 2 — арккосінуса; 3 — арктангенса; 4 — арккатангенса.

**АДВЕ́ДКІ**, традыцыйны звычай бел. радзіннай абраднасці — наведванне парадзіхі пасля родаў; лакальныя назвы водведы, адведзіны, провідкі, наведы. У А. ішлі звычайна замужнія жанчыны ў першыя 2—3 дні (на Палессі — у 2 тыдні і болей) пасля родаў, каб дапамагчы парадзісе і яе сям'і. Паводле звычаю ў А. неслі з сабою яешню, хлеб, кашу, сыр, мёд, на Палессі яшчэ боршч, аладкі, варэнікі і інш. Звычай захаваўся, але ў А. сталі хадзіць і мужчыны, і незамужнія.

**АДВЕ́КЦЫЯ** (ад лац. advectio дастаўка), 1) у метэаралогіі гарызантальнае перамяшчэнне паветраных мас, якое абумоўлівае перанос цяпла і вільгаці з адных раёнаў Зямлі ў іншыя; адзін з найважн. фактараў фарміравання надвор'я. Адбываецца ў выніку руху *цыклонаў*, пераносу паветра пануючымі вятрамі. Тэр. Беларусі знаходзіцца пад уплывам А. амаль $^2/_3$ года. Гл. таксама *Канвекцыя*. 2) У акіяналогіі А. — перанос вады ў гарызантальным, іншы раз у вертыкальным напрамку (гл. *Марскія цячэнні*).

**АДВЕНТЫ́СТЫ** (ад лац. adventus прышэсце), паслядоўнікі хрысціянскай плыні ў *пратэстантызме*.

Вучэнне адвентызму ўзнікла ў 1830-я г. ў ЗША, заснавальнік У.Мілер. Прапаведуюць блізкасць 2-га прышэсця Хрыста і ўстанаўлення на Зямлі 1000-гадовага царства Божага, уваскрэсенне мёртвых, пекла для грэшнікаў. Прызнаюць абрады водахрышчэння, прычашчэння, узаемнага абмывання ног. Абавязковай прызнаюць плату 1/10 часткі даходаў на карысць абшчыны, місіянерскую дзейнасць. Маюць некалькі галін: А. першага дня, сёмага дня (найб. пашыраны), рэфармісты і інш.

Групы абшчын А. утвараюць злучэнні, з якіх складаюцца уніёны (саюзы), дывізіёны. У дывізіён уваходзяць А. некалькіх дзяржаў (напр., у б. СССР А. складалі 1 дывізіён). Цэнтр А. знаходзіцца ў Вашынгтоне. Усяго ў свеце каля 3 млн. А., з іх 1 млн. А. сёмага дня. Адвентызм належыць да таталітарных культаў, уплывае на свядомасць, пачуцці і паводзіны веруючых, якія знаходзяцца ў трывожным чаканні «канца свету». На Беларусі А. з'явіліся ў 1920-я г. ў зах. рэгіёнах. Першым місіянерам на Палессі быў М.Даўгун (у 1921 вярнуўся з заробкаў з ЗША), актыўную дзейнасць вялі прыезджыя місіянеры. У 1925 у Столінскім р-не створана першая абшчына. У 1973 на Беларусі было каля 300 А., у 1988 іх колькасць падвоілася. На 1995 існавала больш за 20 абшчын, з іх 10 на Брэстчыне.

*К.С.Пракошына.*

**АДВЕНТЫ́ЎНЫЯ РАСЛІ́НЫ**, заносныя расліны, ненаўмысна занесеныя ў пэўны рэгіён чалавекам або прыродным шляхам (вада, вецер, міграцыі жывёл, птушак і інш.) віды раслін, якія ў ім прыжыліся. Занос садзейнічаюць гандаль с.-г. прадукцыяй (зернем, бавоўнай, воўнай), інтэнсіўны транспартны абмен, перасяленне людзей і інш. А.р. могуць выцясняць абарыгенныя віды, парушаць структуру біягеацэнозаў, супраць пашырэння асобных з іх (небяспечнае пустазелле) прымаюць меры *каранціну*. У флоры Беларусі больш за 100 відаў А.р. З Еўропы занесены авёс шчаціністы, палявічка малая, з Амерыкі — купалка аднагадовая, аксамітнік сіняваты, галінзога драбнакветная, аксамітнік адкінуты, з Азіі — грэчка татарская, торбачнік палявы, аксамітнік хвастаты і інш.; з Афрыкі — лебяда пахучая.

**АДВЕРБІЯЛІЗА́ЦЫЯ** (ад лац. adverbium прыслоўе), пераход у прыслоўі словаформаў інш. часцін мовы, якія абумоўлены іх сінтаксічнымі функцыямі і зменамі лексічнага і грамат. значэнняў. Адвербіялізуюцца: назоўнікі ўскосных склонаў («прыехаць раніцай»), прыметнікі («прыбіраць збольшага»), лічэбнікі («працаваць удваіх»), займеннікі («адбылося па-нашаму»), дзеепрыметнікі («сказаць адкрыта»), дзеепрыслоўі («глядзець седзячы»), часціцы («плесці-

ся абы-абы»). У выніку А. канчаткі зменных часцін мовы ператварыліся ў прыслоўныя суфіксы, а прыназоўнікі, што ўжываюцца з рознымі склонавымі формамі, сталі прыстаўкамі прыслоўяў: «**З боку** вёскі даносіліся галасы» (І.Мележ), «**Збоку**, ля самай дарогі, ляжаў вялікі камень» (К.Чорны). Адвербіялізаваныя словаформы становяцца нязменнымі, набываюць новыя сінтаксічныя функцыі і сувязі, часам змяняюць месца націску (*«бе́гам — бягом»*, *«кру́гам — кругом»*) і інш. *І.Л.Бурак.*

**АДВЕ́С**, груз, падвешаны на ніці; найпрасцейшае прыстасаванне для вызначэння вертыкалі. Пад дзеяннем сілы цяжару грузу нітка прымае верт. напрамак, адпаведны дадзенаму пункту зямной паверхні. Выкарыстоўваецца ў буд-ве, пры ўстаноўцы вымяральных прылад, вымярэнні глыбіняў і інш.

**АДВО́Д** у судаводстве, адхіленне суддзі (засядацеля) ад удзелу ў разглядзе пэўнай справы ў сувязі з яго асабістай зацікаўленасцю ў выніку справы або па інш. абставінах, якія выклікаюць сумненне ў непрадузятасці. Заканадаўства Рэспублікі Беларусь прадугледжвае таксама А. пракурору, следчаму, асобе, якая вядзе дазнанне, сакратару суд. пасяджэння, эксперту, спецыялісту, перакладчыку, панятому, калі яны асабіста, прама ці ўскосна, зацікаўлены ў выніках справы. Правілы А. садзейнічаюць усебаковаму, поўнаму і аб'ектыўнаму даследаванню акалічнасцяў справы і прыняццю правільнага рашэння. *І.І.Пацяружа.*

**АДВО́ДАК**, частка надземнага сцябла з пупышкамі, якая на час укаранення не аддзяляецца ад мацярынскай расліны. Для атрымання вертыкальных А. матачныя кусты абразаюць, пакідаючы пянькі выш. 2—3 см. Пасля дасягнення верт. парасткамі выш. 12—15 см кусты акучваюць вільготнай глебай 2—3 разы да ўтварэння пагорачкаў выш. 25—30 см на працягу росту расліны. Выкарыстоўваюць пры размнажэнні клонавых прышчэпаў яблыні і грушы. Размнажэнне гарызантальнымі А. робіцца прышпільваннем парасткаў да зямлі і акучваннем. Выкарыстоўваюць для ягадных культур, айвы, шаўкоўніцы і інш. Дугападобныя (змеепадобныя) А. робяць пры размнажэнні цяжкакараняльных раслін з доўгім перыядам коранеўтварэння (напр., актынідыі).

**АДВО́ДЫ**, возера ў Беларусі, у Полацкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Крашанка. За 24 км на ПдЗ ад Полацка. Пл. 0,3 км², даўж. 0,8 км, найб. шыр. 0,4 км. Пл. вадазбору каля 32 км². Злучана ручаём з воз. Зыкоўскае, на Пд выцякае ручай у р. Крашанка.

**АДВО́РАНСКАЕ ВО́ЗЕРА**, у Беларусі, ва Ушацкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Тураўлянка. Пл. 0,25 км², даўж. 0,88 км, найб. шыр. 0,43 км, найб. глыб. 7,1 м, даўж. берагавой лініі 2,1 км. Пл. вадазбору 2,3 км². Схілы выш. ад 3 да 8 м. Берагі сплавінныя. Дно выслана сапрапелем. Злучана ручаём з воз. Янова.

**АДГЕ́ЗІЯ** (ад лац. adhaesio прыліпанне), 1) счапленне паверхняў разнародных цвёрдых ці вадкіх целаў (фазаў) пры кантактаванні. Абумоўлена тымі ж прычынамі, што і *адсорбцыя*. Характарызуецца адгезійнай трываласцю — работай, неабходнай для раздзялення целаў у разліку на адзінку паверхні; цесна звязана з *кагезіяй*. Уплывае на мех. ўласцівасці кампазіцыйных матэрыялаў. Улічваецца пры нанясенні палімерных пакрыццяў, склейванні, спяканні, зварцы, луджэнні і інш., павялічвае *трэнне*. 2) У біялогіі А. клетак — здольнасць іх зліпацца паміж сабой і з рознымі субстратамі біял. і небіял. паходжання. Залежыць ад стану вонкавай паверхні плазматычнай мембраны і складу пазаклетачнага асяроддзя. Для ажыццяўлення А. неабходна прысутнасць іонаў кальцыю і магнію. Паводле сучасных меркаванняў за міжклетачную А. адказныя *глікапратэіды*. Большасці клетак уласціва выбіральная А. З яе парушэннем звязана здольнасць пухлінных клетак да метастазавання. На А. заснавана *агрэгацыя* клетак.

**АДГО́Н**, абястлушчанае малако пасля аддзялення вяршкоў ад цэльнага малака. Састаў А. залежыць ад зыходнага саставу цэльнага малака і ступені яго абястлушчвання. Мае ў сярэднім каля 3,2% бялкоў, 4,8% малочнага цукру, 0,05% тлушчу, 0,7% мінер. рэчываў. Выкарыстоўваецца як харч. дыетычны прадукт, на прыгатаванне сухога і згушчанага малака, сыраквашы, кефіру, кумысу, сыру і інш., выраб казеіну, як корм для маладняку жывёлы і птушак.

**АДГО́Р'Е**, адносна кароткае вузкае адгалінаванне *горнага хрыбта*, якое адыходзіць ад галоўнага хрыбта пад вуглом; хрыбет другога парадку. Утвараецца пры расчляненні гор мясц. вадасцёкамі, а таксама ў выніку разгалінавання горных ланцугоў, часам пры мясц. неатэктанічных падняццях.

**АДДЗЕ́Л** у геалогіі, самае буйное падраздзяленне геал. сістэмы, якое мае планетарнае пашырэнне; адзінка агульнай *стратыграфічнай шкалы*. Аб'ядноўвае адклады, што ўтварыліся на працягу геал. эпохі. Кожны А. адасабляецца па характэрных рэштках выкапнёвай фауны і флоры і падзяляецца на *ярусы*.

Размнажэнне прышчэпаў **адводкамі**: 1 — гарызантальныя адводкі (*а* — прышпільванне галін; *б* — выгляд куста восенню; *в* — аддзелены адводак, прыдатны для пасадкі); 2 — вертыкальныя адводкі (*а* — зрэзаны адводак; *б* — куст восенню пасля 2—3 акучванняў; *в* — той самы куст, разакучаны для аддзялення адводкаў; *г* — укаранёныя парасткі).

**АДДЗЕ́Л КІРАЎНІЦТВА ПРАВІНЦЫЯМІ ЛІТВЫ́** (Wydział zarządzający prowincjami Litwy), орган кіравання *паўстаннем 1863—64* у Літве і на Беларусі. Створаны ў сак. 1863 у Вільні замест скасаванага *Часовага правінцыяльнага ўрада Літвы і Беларусі*. Узнік у выніку змовы памешчыцкай групоўкі «белых» з камісарам варшаўскага паўстанцкага ўрада ў Літве і на Беларусі Н.*Дзюлёранам*. У склад аддзела ўвайшлі «белыя»: Я.Гейштар (старшыня), А.Аскерка, Ф.Далеўскі, І.Лапацінскі, А.Яленскі. 27.2.1863 аддзел абвясціў несапраўднымі ўсе мандаты Часовага ўрада. «Белыя» імкнуліся звузіць сац. базу паўстання, паставіць на камандныя пасады сваіх аднадумцаў. Аддзел выдаваў загады і

адозвы (у т.л. маніфест да бел. сялян ад 3.5.1863 на бел. мове), газеты. У канцы мая — пач. чэрв. 1863 Аскерка, Далеўскі і Яленскі арыштаваны, замест іх уведзены прадстаўнікі *«чырвоных»* К.Каліноўскі і У.Малахоўскі, намаганнямі якіх выдадзены дакументы радыкальнага характару, у т.л. «Прыказ... да народу зямлі літоўскай і беларускай» (11.6.1863), № 7 «Мужыцкай праўды» 26.6.1863 А.к.п.Л. перайменаваны ў *Выканаўчы аддзел Літвы.* *Г.В.Кісялёў.*

**АДДЗЕ́ЛАЧНЫЯ МАТЭРЫЯ́ЛЫ** ў будаўніцтве, матэрыялы для *аддзелачных работ.* Падзяляюцца на А.м. вонкавай і ўнутранай аддзелкі, на канструкцыйна-аддзелачныя і эксплуатацыйна-аддзелачныя. Да А.м. належаць *лакафарбавыя матэрыялы, абліцовачныя матэрыялы,* аддзелачныя растворы і бетоны, прыродныя і штучныя каменныя матэрыялы, аддзелачная кераміка, матэрыялы і вырабы са шкла (гл. *Шкла-блокі, Шклопрафіліт, Шкляная плітка*), з драўніны (паркет), паперы (*шпалеры*), пластычных мас (сінт. плёнкі, *лінолеум, рэлін*), дывановыя пакрыцці для падлогі і інш.

**АДДЗЕ́ЛАЧНЫЯ РАБО́ТЫ** ў будаўніцтве, работы, звязаныя з выкарыстаннем *аддзелачных матэрыялаў* у мэтах павышэння даўгавечнасці, паляпшэння эксплуатацыйных, санітарна-гігіенічных і архітэктурна-маст. якасцяў збудаванняў. Да А.р. належаць *малярныя работы, абліцовачныя работы, шкляныя работы,* шпалерныя і штукатурныя работы, устаноўка сталярных вырабаў і дэталяў, насціланне падлогі (у тым ліку паркету). Паслядоўнасць і сумяшчэнне з інш. буд. работамі залежаць ад асаблівасцяў канструкцыі і тэхналогіі ўзвядзення збудаванняў, часткова выконваюцца пры вытв-сці буйнапамерных зборных элементаў.

**АДДЗЯЛЕ́ННЕ** ваеннае, 1) воінскае страявое падраздзяленне ва ўзбр. сілах большасці краін. Складаецца з 6—12 чал. на чале з камандзірам (сяржантам, старшынай). Уваходзіць у склад *узводаў* — мотастралк., пяхотных (мотапяхотных) і інш. У танк. войсках і авіяцыі А. адпавядае экіпаж танка, самалёта, у артылерыі — разлік гарматы. На караблі А. аб'ядноўвае асабовы склад адной спецыяльнасці і звычайна ўваходзіць у склад каманды. 2) Арганізацыйная адзінка ў штабах, ваенна-навуч. установах і інш. (А. кадраў, страявое А. і інш.).

**АДДЗЯЛЕ́ННЕ ЦАРКВЫ́ АД ДЗЯРЖА́ВЫ**, дзяржаўная палітыка адхілення царквы ад вядзення актаў цывільнага стану і ўдзелу ў дзярж. кіраўніцтве. Канстытуцыйна ажыццёўлена ў нешматлікіх краінах (ЗША, Францыя, б. СССР і інш.). У канстытуцыях больш як 40 дзяржаў прадугледжаны статус дзярж. або пануючай рэлігіі і царквы (у Іспаніі, Італіі, Балівіі — каталіцызм, Іране, Саудаўскай Аравіі, Кувейце — іслам, у Ізраілі — іудаізм, у Тайландзе — будызм). Мае месца і канстытуцыйнае прызнанне роўнасці рэлігіі і царквы без А.ц. ад дз. (Японія, ФРГ і інш.). У Рэспубліцы Беларусь А.ц. ад дз. ажыццяўляецца на аснове неўмяшання дзяржавы ва ўнутрыцаркоўныя справы, самастойнага і канстытуцыйнага права кожнага грамадзяніна вызначаць адносіны да рэлігіі, вызнаваць любую рэлігію або не вызнаваць ніякай.

**АД'ЕКТЫВА́ЦЫЯ** (ад лац. adjectivum прыметнік), пераход у прыметнікі словаформаў інш. часцін мовы. Часцей за ўсё пераходзяць дзеепрыметнікі, калі яны страчваюць працэсуальныя адзнакі і набываюць атрыбутыўныя прыкметы, што ўказваюць на ўласцівасць прадмета ці з'явы («квітнеючы край», «любімая кніга»), і зрэдку — парадкавыя лічэбнікі («першы снег»), абагульнена-якасныя займеннікі («У машыніста хлеб траякі — чорны, белы і ніякі», М.Лынькоў). Ад'ектываванцца могуць не ўсе дзеепрыметнікі, лічэбнікі і займеннікі, што звязана з асаблівасцямі іх семантыкі, марфемнага саставу, замацаванасцю ці незамацаванасцю спалучэння з назоўнікамі і інш. *І.Л.Бурак.*

**АДЖА́НТА** (Ajanta), комплекс будыйскіх манастыроў 2 ст. да н.э. — 7 ст. н. э., высечаных у скалах каля пас. Аджанта ў штаце Махараштра ў Індыі. Складаецца з 29 пячорных залаў: 4 «чайцья» (малельныя залы) і 25 «віхар» (квадратныя залы, акружаныя з трох бакоў келлямі). Сусветна вядомая насценная размалёўка пячор вызначаецца багаццем фантазіі, прыгажосцю колеру і рытму. Жывапіс, што захаваўся ў фрагментах, — ілюстрацыі да будыйскай міфалогіі, але ў ім шырока паказана карціна інд. побыту таго часу.

Да арт. **Аджанта.** Прынцэса, якая памірае. Фрагмент размалёўкі.

«Чайцья» ў Аджанце.

**АДЖА́РЫЯ**, Аджарская Аўтаномная Рэспубліка, у складзе Грузіі. Пл. 3 тыс. км$^2$. Нас. 385 тыс. чал. (1987), гарадскога 16%; грузіны (аджарцы), рускія, армяне і інш. Сталіца — г. *Батумі*. Найб. гарады: Кабулеты, Хула, Шуахеві, Ачхамуры.

**Прырода.** А. размешчана ў паўд.-зах. ч. Закаўказзя, на З абмываецца Чорным м. Большая ч. тэр. занята горнымі хрыбтамі і адгор'ямі М.Каўказа. З ПдЗ на ПнУ А. перасякае Месхецкі (Аджара-Імерэцінскі) хрыбет, яго адгор'і — Чаквінскі хрыбет і Кабулецкія горы; на У Арсіянскі хрыбет; на Пд па граніцы з Турцыяй Шаўшэцкі хрыбет. Карысныя выкапні: медзь, поліметалічныя руды, вогнетрывалыя гліны. Гідрарэсурсы. Крыніцы лячэбных мінер. водаў. Клімат прыморскай нізіны вільготны субтрапічны, у гарах — ад умерана цёплага да халоднага. Сярэдняя т-ра студз. ў прыморскай паласе ад 4 °С да 6 °С, у гарах ад 2 °С да -2 °С; ліп. адпаведна 20—23 °С і 22—16 °С. Гадавая колькасць ападкаў на ўзбярэжжы і схілах 2500—2800 мм, ва ўнутраных раёнах 1000—1400 мм. Сярэдняя працягласць безмарознага перыяду ў прыморскай паласе 300 дзён; самы цёплы раён Закаўказзя. Рака Чарох (нізкае цячэнне) з прытокам Аджарысцкалі — гал. водныя артэрыі, апошняя са значнымі гідраэнергарэсурсамі. На нізінах пашыраны алювіяльныя, часткова забалочаныя глебы, на перадгор'ях — чырваназемы, па схілах гор — бурыя лясныя і горна-лугавыя. Больш як палавіна тэр. пад лясамі. Да выш. 600 м пераважаюць шыракалістыя лясы (каштан, дуб, граб, бук) з вечназялёным падлескам з ліян, лаўравішні, пантыйскага рададэндрана (па цяснінах самшыт), да 1500 м — мяшаныя лясы (пераважае бук), якія змяняюцца на хвойныя (хвоя, елка), вышэй за 1800 м — зараснікі хмызняку, яшчэ вышэй — субальпійскія і альпійскія лугі. Прыморскія нізіны і перадгор'і асвоены пад субтрапічныя і тэхн. культуры. У горных лясах разнастайны жывёльны свет: казуля, дзік, шакал, барсук, куніца. Кінтрышскі запаведнік і Батумскі бат. сад.

**Гісторыя.** Першыя звесткі пра А. адносяцца да 6—4 ст. да н.э., калі яна ўваходзіла ў Калхідскае царства, потым Іберыю; у 4 ст. ў складзе груз. дзярж. аб'яднання — Лазіка. У 6 ст. А. — арэна барацьбы паміж Візантыяй і Іранам. З канца 10 ст. — частка груз. феад. дзяржавы, кіравалася эрыставамі (царскімі правіцелямі правінцый). У 11—13 ст. пражыла нашэсці сельджукаў і манголаў. У 2-й пал. 16 ст. захоплена Турцыяй, супраць прыгнёту якой насельніцтва паўставала ў 1680, 1685, 1697, 1744, 1819, 1856. У выніку рус.-тур. вайны 1877—78 А. далучана да Рас. імперыі, увайшла ў склад Кутаіскай губ. З канца 1880-х г. тут развіваецца прам-сць, праз тэр. А. ў 1897—1907 пракладзены нафтаправод Баку—Батум. У 1-ю сусв. вайну на тэр. А. ішлі ваен. дзеянні. Пасля Лют. рэв. 1917 знаходзілася пад уладай *Асобага закаўказскага камітэта*, з ліст. 1917 — *Закаўказскага камісарыята*. У крас. 1918 Батум, частку Гурыі і інш. раёны А. захапілі туркі, у снеж. 1918 — ліп. 1920 акупіравана англ. войскамі. У ліп. 1920 да ўлады ў А. прыйшлі меншавікі. 11.3.1921 Батум зноў акупіравалі тур. войскі. 18 сак. з дапамогай Чырв. Арміі ўстаноўлена сав. ўлада. 16 ліп. створана Адж. АССР у складзе Груз. ССР. 12.3.1922 А. як састаўная ч. Грузіі ўвайшла ў *Закаўказскую федэрацыю*. 25.10.1937 на 12-м Усеаджарскім з'ездзе Саветаў была прынята Канстытуцыя Адж. АССР. Пасля абвяшчэння Грузіяй у 1991 дзярж. незалежнасці А. захавала статус аўт. рэспублікі ў яе складзе.

**Гаспадарка.** Гал. галіны прам-сці: нафтаперапр. (Батумі), машынабуд. (эл.-тэхн. вырабы, абсталяванне для харч. прам-сці, суднабудаванне), харчасмакавая (чайная, вінаробная, кансервавая і інш.). Ёсць хім.-фармацэўтычная, лёгкая, дрэваапр. прам-сць, працуе Аджарысцкальская ГЭС. А. — самая развітая ч. Грузіі ў галіне субтрапічнай гаспадаркі. Асноўныя с.-г. культуры — чай і цытрусавыя, культывуюцца тунг,

хурма, мушмула, лаўр, эўкаліпт, бамбук. Пасевы збожжавых (кукуруза, ячмень, авёс, рыс), бульбы, тытуню, агародніны. Па схілах гор — вінаграднікі. Гадуюць буйн. раг. жывёлу. У гарах — авечка- і козагадоўля. Шаўкаводства, пчалярства. Вял. роля належыць марскому транспарту. Гал. порт — Батумі. Чыг. Баку—Батумі, шаша Батумі—Новарасійск, нафтаправод Баку—Батумі. Прыморскія курорты: Батумі, Кабулеты, Цыхісдзіры, Зялёны Мыс, Махінджаury.

**Культура.** У 1990 у А. 154 дашкольныя дзіцячыя ўстановы (12,2 тыс. дзяцей), 408 агульнаадук. школ (67 тыс. вучняў), 5 ПТВ (2,7 тыс. навучэнцаў), 9 сярэдніх спец. навуч. устаноў (больш за 3 тыс. навучэнцаў). ВНУ: Батумскі ун-т і філіял Груз. тэхн. ун-та (усяго каля 3 тыс. студэнтаў). 353 б-кі, Дзярж. музей А., Дзярж. музей рэвалюцыі. Навук. даследаванні вядуцца ў філіялах НДІ фітапаталогіі (Кабулеты), Ін-та чаю і субтрапічных культур (Чакві), Груз. НДІ харч. прам-сці, Дзярж. НДІ лакафарбавай прам-сці (усе ў Батумі), Батумскім бат. садзе і інш.

Рэсп. радыё вядзе перадачы на груз. і рус. мовах. Рэтрансліруюцца радыё- і тэлепраграмы з Тбілісі, Сочы, Масквы.

На тэр. А. захаваліся помнікі дагіст. перыяду: менгіры, «квакацэбі» (каменныя чалавечыя фігуры), рэшткі калхідскіх паселішчаў (3—2-га тыс. да н.э.), гарадзішча ў Кабулеты (4—3 ст. да н.э.). Арх. помнікі сярэднявечча: крэпасці Ганіясцыхе, Тамарысцыхе, Барцхана, масты Сапуткрэты, Дандальскі, храм Схалта. Сучаснае нар. мастацтва: разьба па дрэве, маст. апрацоўка металу, вышыўка. У 1939 заснаваны Адж. аддз. Саюза мастакоў Грузіі, у 1962 — Адж. аддз. Саюза архітэктараў Грузіі.

У нар. песнятворчасці А. пераважаюць натуральныя лады, характэрны фігурацыйны тып мелодыкі, часам віртуознага плана, з шырокім выкарыстаннем сінкоп. Пашыраны мужчынскія харавыя спевы а капэла і жаночыя сольныя спевы з інстр. суправаджэннем. Сярод інструментаў: духавыя — чыбоні, саламуры; струнна-шчыпковыя — чангуры, саз, пандуры; струнна-смычковыя — чыянуры, кеманча; ударныя — даўлі (долі), а таксама гармонік т.зв. ўсх. строю. Муз. адукацыя ў А. з 1890-х г. (муз. гурткі і прыватныя муз. класы ў Батумі). Нар. песні збіралі і запісвалі К.Пацхверашвілі, Ш.Мшвелідзе, Дз.Аракішвілі і інш. Працуюць (1988): сімф. аркестр А., камерны хор, філармонія, Ансамбль песні і танца А., муз. вучылішча (Батумі), муз. школы і інш.

У А. з 1880-х г. існавалі груз. драм. гурткі. У 1912 акцёр і драматург Ш.Дадыяні стварыў у Батумі прафес. т-р «Вандроўная трупа», які з 1921 наз. Дзярж. т-р Аджарыі імя І.Чаўчавадзе. Пастаноўкі: «Выгнаннік» Важа Пшавелы, «Цар Эдып» Сафокла, «Гамлет» і «Атэла» У.Шэкспіра і інш.

*В.К.Міхеева* (прырода, гаспадарка).

**АДЖЫ́ВІКА** (санскр.), адно з неартадаксальных стараж.-індыйскіх вучэнняў, якое адмаўляла існаванне душы. Заснавальнікам А. па традыцыі лічаць мудраца Маркалідэка (6—5 ст. да н.э.). Паводле вучэння А., існуюць 4 разнавіднасці атамаў, з якіх пабудаваны 4 стыхіі прыроды: зямля, вада, агонь і паветра; «жыццё» ёсць тое, што ўспрымае і пазнае спалучэнні атамаў. Разнавіднасці атамаў і жыццё ўтвараюць 5 існасцяў, якімі вычэрпваецца ўсё існуючае. Свядомасць уяўляецца як асобны агрэгат звыштонкіх атамаў, што ўваходзяць у «канфігурацыю жыцця»; атамы вечныя, непадзельныя, нікім не створаныя і незнішчальныя. А. выступала пераважна як матэрыялісг. вучэнне, якое процістаяла стараж.-інд. рэлігіі і філасофіі *брахманізму*. У Паўн. Індыі А. злілася з дагматызмам і вішнуізмам, у паўд. Індыі існавала да 14—15 ст.

**АДЖЭМІ́** ібн Абу Бекр (1120-я г., Нахічэвань — пач. 13 ст.), азербай-

джанскі дойлід. Прадстаўнік нахічэванскай арх. школы. У буд-ве мінарэтаў і маўзалеяў Юсуфа ібн Кусеіра і Мамінэхатун спалучаў манументальнасць аб'ёмаў з вытанчанасцю іх чляненняў і ажурнасцю дэкору, выкарыстоўваў рацыянальныя канструкцыі (нервюры, цагляныя блокі).

**АДЗА́ВА** Сэйдзі (н. 1.9.1935, г. Хатан, Кітай), японскі дырыжор. Вучыўся ў Токіо, у Парыжы і Зах. Берліне. З 1961 у Нью-Йоркскім філарманічным аркестры, з 1965 у Таронта, з 1970 гал. дырыжор сімф. аркестраў у Сан-Францыска і Бостане. Адзін з кіраўнікоў фестываляў Беркшырскага муз. цэнтра ў Танглвудзе (ЗША, з 1970). Першыя прэміі на Міжнар. конкурсах дырыжораў (Безансон, Францыя, 1959; Танглвуд, 1960).

**АДЗА́ЛА** (Odzala), нацыянальны парк у Конга. Засн. ў 1935 (да 1940 запаведнік) у вярхоўях р. Мамбілі (прыток р. Ліквала). Пл. 110 тыс. га. Біясферны рэзерват. Захоўваюцца вільготны трапічны лес і саванна. У фауне звычайныя афрыканскі слон, буйвал, карлікавы буйвал, бонга, кустовая свіння, леапард, залаты кот і інш.

**АДЗЕ́ННЕ**, штучнае покрыва цела чалавека; у шырокім сэнсе ўключае *галаўныя ўборы, абутак* і інш. Яго агульны выгляд залежыць ад прыродна-кліматычных умоў, відаў і спосабу гасп. дзейнасці, нац. традыцый, узроўню развіцця вытв. сіл, маёмасна-прававых адносін, этычных поглядаў і патрабаванняў. У гісторыі грамадства выконвала і выконвае функцыі магічную, абрадавую, адрознення паводле полу, узросту, сямейнага становішча, саслоўнай, этн. і рэліг. прыналежнасці, паводле роду заняткаў і службовага становішча, найперш утылітарную і эстэтычную. Нясе ў сабе і маст. вобраз, таму выступае як від дэкар.-прыкладнога мастацтва і залежыць ад маст. стылю эпохі.

А. ўзнікла ў сярэднім старажытнакаменным веку і прайшло складаны шлях эвалюцыі. Як сац. з'ява і як прадмет мастацтва ўвасабляла ўяўленні розных гіст. эпох аб ідэальным чалавеку, яго ўнутр. сутнасці і фіз. абліччы. Так, А. стараж. грэкаў з іх ідэалам доблеснага і прыгожага воіна-атлета толькі злёгку падкрэслівала гарманічнасць фігуры; А. сярэднявечча згодна з хрысціянскімі догмамі пра грахоўнасць цела хавала яго пад цяжкімі бясформеннымі тканінамі; у эпоху Адраджэння, калі нормай прыгажосці стаў прызнавацца чалавек, А. стала больш зручным, як бы выяўляла гармонію ўнутр. і знешняга ў чалавеку; у перыяд Асветніцтва, калі эталонам прыгожага была прырода, а ўзорам для пераймання антычнасць, А. набыло натуральныя спакойныя формы. Спалучэнне ў адзіным маст. стылі кампанентаў А. і прадметаў, што яго дапаўняюць, стварае ансамбль, які наз. касцюмам. Касцюмы падзяляюцца на 3 асн. тыпы: драпіраваны (з абгорнутага вакол цела кавалка тканіны, замацаванага непасрэдна на фігуры), накладны (надзяваецца праз галаву і як бы накладаецца на плечы), расхінны (мае спераду разрэз зверху данізу).

Вытокі бел. А. ў культуры ўсх.-слав. плямёнаў. Умерана кантынентальны клімат вымагаў закрытага, цёплага А. Тканіны выраблялі з лёну (радзей канапель) і воўны, упрыгожвалі нашываннем, натыканнем, вышываннем ці набіўным узорам. Баярства шыла А. пераважна з прывазных тканін (парча, аксаміт, тафта, камка); аздобаю служыла вышыўка шоўкам і жэмчугам. Амаль усе віды А. былі накладныя. Аснову мужчынскага гарнітура складалі *кашуля* з поясам і *нагавіцы*, жаночага — кашуля (даўжэйшая за мужчынскую) і паясное А. тыпу панёвы; верхняя вопратка — світа (зімой падшытая футрам). Мужчыны насілі шапкі з футра, сукна ці лямцу, дзяўчаты — вянец, замужнія жанчыны — чапец, а паверх — убрус. Абуваліся ў пасталы, поршні ці боты (жаночыя часта вышывалі). Гэтыя асаблівасці перайшлі ў А. насельніцтва ВКЛ, дзе ў 13—16 ст. сфарміравалася бел. народнасць. У касцюме беларусаў адчуваецца блізкасць да касцюма літоўцаў і палякаў, а таксама рускіх і інш. еўрап. народаў. Выпрацоўка ў Зах. Еўропе асн. спосабаў і прыёмаў крою, удасканаленне кравецкага рамяства прывяло А. да істотных змен. А. магнатаў, шляхты і гар. знаці развівалася ў рэчышчы зах.-еўрап. моды. Важнымі часткамі іх мужчынскага гарнітура былі атласны жупан, зверху кунтуш, падпяразаны доўгім поясам, воўчае (вільчура) і бабровае футра, жаночае — ферэзія, чамара, аблямаваныя карункамі або футрам собаля, куніцы, лісы, кабат з рукавамі. Спрашчэнне А. арыстакратаў пачалося з канца 18 ст. Народнае А. больш яскрава, чым А. інш. слаёў грамадства, выяўляла маральныя нормы і эстэт. густы. Нар. касцюм уздзейнічаў на касцюм вышэйшых класаў і сам зазнаваў яго ўплыў. У ім найлепш захаваліся традыцыі нац. А. У 14—16 ст. бел. касцюм узбагаціўся новымі відамі (*андарак, гарсэт*) і прынцыпамі афармлення (спосабы завязвання *наміткі*). Ён меў характэрныя прыкметы касцюма готыкі і рэнесансу, а з найб. спецыфічных — тэндэнцыі да агульнай строгасці ансамбля, перавагі белага ко-

Адзенне: 1 — княжацкае 11—12 ст.; 2 — баярскае 12—13 ст.; 3 — гараджан 12—13 ст.; 4—5 — магнатаў 16—17 ст.; 6 — сялян 15 ст.

леру, спалучэння белага з чырвоным у каларыстыцы, геам. узораў у арнаментыцы. Бел. касцюм у гэты час набыў сваю завершанасць, утылітарны і маст. вобраз. Яго развіццё ў 17 — сярэдзіне 19 ст. ішло па шляху мадыфікацыі асобных элементаў А., насычэння колеравай гамы, пераасэнсавання арнаментальных матываў, замацавання рэгіянальных адметнасцяў. У перыяд фарміравання бел. нацыі захоўвалася выразнае этнагр. аблічча бел. нар. А. Касцюм сялян той пары — класічны ўзор бел. нар. мастацтва. Даўнімі традыцыямі было вызначана, якое А. насіць у будні ці святы, надзяваць на вяселле ці на радзіны, падчас радасці ці жалобы. У традыц. комплекс мужчынскага А. ўваходзілі кашуля, нагавіцы і

Да арт. **Адзенне**. 1—2 — селянін і сялянка. Паводле Норбліна (канец 18 — пач. 19 ст.); 3—4 — дзяўчына і жанчына з Піншчыны. Паводле Рабцэвіча (канец 18 — пач. 19 ст.).

Беларускае народнае адзенне. Строі Цэнтральнай Беларусі і Панямоння: пухавіцкі (1), ляхавіцкі (2), капыльска-клецкі (3), слуцкі (4), вілейскі (5), мастоўскі (6), навагрудскі (7), ваўкавыска-камянецкі (8—9).

Да арт. **Адзенне.** 1 — селянін. Паводле А.Рыгельмана (канец 18 ст.); 2 — сялянка з цэнтральнай Беларусі. Паводле К.Вуйціцкага (пач. 19 ст.); 3—4 — селянін з Палесся і жанчына з-пад Кобрына. Паводле Ю.Крашэўскага (1-я чвэрць 19 ст.).

камізэлька. Кашулю насілі навыпуск, падпяразвалі поясам, калошы абгортвалі анучамі і запраўлялі ў скураныя *пасталы, лапці*, боты, зімой — у *валёнкі*. Галаўнымі ўборамі былі саламяны капялюш (*брыль*) ці валеная *магерка*, зімой заечая ці аўчынная *аблавуха*. Мужчынскае А. мела сціплае аздабленне, у ім пераважаў белы колер. Найб. ўзлёту фантазіі і майстэрства бел. А. дасягнула ў жаночым касцюме, своеасаблівасць якога вызначае адметнасць нац. касцюма беларусаў увогуле. Жаночая кашуля кроілася з прамавугольных кавалкаў ільняной тканіны. Найб. ўвага аддавалася ўпрыгожанню рукавоў, што звязана з маст. тэктонікай і пластыкай касцюма, а таксама з верай у магічную

Беларускае народнае **адзенне.** Строі заходняга і ўсходняга Палесся: дамачоўскі (10), маларыцкі (11), кобрынскі (12), пінска-івацэвіцкі (13), мотальскі (14), давыд-гарадоцка-тураўскі (15), турава-мазырскі (16), калінкавіцкі (17), брагінскі (18).

сілу чырвонага рамбічнага арнаменту. Разнастайнае паясное А. жанчыны: многія віды спадніц (андарак, *саян*, палатнянік, летнік), а таксама панёвы, *фартухі*. Малюнак спадніцы і панёвы — клетка, падоўжныя або папярочныя палосы ў чырвоным, сіне-зялёным ці серабрыста-белым каларыце. Фартух гарманіраваў з кашуляй. У жаночае, асабліва святочнае, убранне ўваходзіў і гарсэт у выглядзе безрукаўкі. Шылі яго звычайна з крамных тканін (аксаміт, парча, шоўк), аздаблялі вышыўкай, аплікацыяй, нашыўкамі тасёмак, стужак, гузікаў. Касцюм мог дапаўняцца разнаколерным поясам з кутасамі. Галаўныя ўборы залежалі ад узросту і сямейнага становішча жанчыны. У дзяўчат гэта былі перавязкі накшталт вузкіх ручнікоў (*скіндачка, шлячок*), вянкі. Замужняй жанчыне не дазвалялася паказвацца на людзях з непакрытай галавой. Жаночыя галаўныя ўборы падзяляюцца на ручніковыя

Да арт. Адзенне. К.Русецкі. Жняя. 1845.

Да арт. Адзенне. І.Рэпін. Беларус. 1892.

Беларускае народнае адзенне. Строі Прыдняпроўя і Наддзвіння: магілёўскі (19—20), краснапольскі (21), буда-кашалёўскі (22), неглюбскі (23), лепельскі (24), дубровенскі (25), аствравецка-дзісенскага рэгіёна (26—27).

(намітка, сярпанка, *хустка*), рагацістыя (галовачка), каптуровыя (*каптур, чапец, падвічка*). Самы пашыраны і адмысловы — намітка. Будзённым абуткам жанчыны былі лапці, святочным — пасталы і чорныя хромавыя чаравікі. Верхняя мужчынская і жаночая вопратка мала адрозніваласа. Яе шылі з валенага нефарбаванага сукна (світа, *сярмяга, бурка, бурнос*), аўчыны (*кажух*, кажушок). Насілі таксама *бравэрку*, каптан, *кабат*. Пранікненне ў вёску прамысловых вырабаў «размывала» жанравыя межы традыц. нар. касцюма. У 20 ст. многія віды і састаўныя часткі традыц. А. выйшлі з ужытку. Нар. А. аднатыпнае на ўсёй тэр. Беларусі, але ў ім вылучаюць 4 асн. комплексы (залежна ад таго, з чым насілі кашулю ў жаночым касцюме): са спадніцай і фартухом; са спадніцай, фартухом і гарсэтам; са спадніцай, да якой прышыты ліф-гарсэт, і фартухом; з панёвай, фартухом, гарсэтам. Першыя 2 вядомыя ўсюды, 2 другія — ва ўсх. і паўд.-ўсх. раёнах. Комплексы маюць шэраг лакальных разнавіднасцяў, якія вылучаюцца як нар. строі. Найб. вывучаны строі Зах. і Усх. Палесся, Падняпроўя, Цэнтр. Беларусі, Панямоння, Паазер'я (пра кожны строй гл. адпаведны артыкул). Паасобныя матывы традыц. А. выкарыстоўваюць мадэльеры пры распрацоўцы сучаснага касцюма.

*Літ.:* Маслова Г.С. Народная одежда русских, украинцев и белорусов в XIX — начале XX в. // Восточнославянский этнографический сборник. М., 1956; Беларускае народнае адзенне. Мн., 1975; Каминская Н.М. История костюма. М., 1977; Раманюк М.Ф. Беларускае народнае адзенне: [Альбом]. Мн., 1981; Ягож. Народны касцюм Чачэрска і ваколіц: Канец XIX — сярэдзіна XX стст. Мн., 1993; Раманюк М., Ліцвінка В., Раговіч У. Песні і строі Піншчыны. Слонім, 1994.

*М.Ф.Раманюк.*

**АДЗЁР**, вострая вірусная хвароба чалавека, якая характарызуецца павышанай тэмпературай, інтаксікацыяй, катаральным запаленнем верхніх дыхальных шляхоў і вачэй, высыпкай на целе. Перадаецца паветрана-кропельным шляхам ад хворага. Інкубацыйны перыяд 8—10 (макс. 17) дзён. Хварэюць людзі любога ўзросту, але часцей дзеці ад 1 да 7 гадоў (да 3 месяцаў дзейнічае матчын імунітэт).

Адрозніваюць 3 перыяды хваробы: катаральны (3—4 дні), калі з'яўляюцца дробныя шаравата-белыя з чырвонай аблямоўкай плямкі на слізістай губ; перыяд высыпання (4—5 дзён) — высыпка з'яўляецца на твары, затым на ўсім целе; праз 3—4 дні яна знікае, застаецца пігментацыя і лушчэнне скуры; працягваецца 7—10 дзён. На ўсіх стадыях хваробы могуць узнікнуць ускладненні на органы дыхання (ларынгіт, фарынгіт, трахеіт, пнеўманія, абсцэс лёгкага), страўнікава-кішачны тракт (стаматыт, энтэракаліт), на скуру (піядэрмія), нервовую сістэму (менінгіт, менінгаэнцэфаліт, міеліт, энцэфаламіеліт), зрок (кератыт) і слых (атыт). Спецыфічных лек. сродкаў супраць А. няма. Найб. дзейсны метад прафілактыкі — супрацьадзёрная вакцына. Прышчэпкі робяць дзецям у 12 месяцаў і ў 7 гадоў.

**А́ДЗІ**, Адзі (Ady) Эндрэ (22.11.1877, с. Эрміндсент, Венгрыя — 27.1.1919), венгерскі паэт, публіцыст. Вучыўся ў Дэбрэцэнскім ун-це. Першы зб. «Вершы» (1899). У зб-ках «Новыя вершы» (1906), «Кроў і золата» (1907), «Хацеў бы, каб мяне любілі» (1909), «На чале мерцвякоў» (1918), прасякнутых рэв.-рамант. сімволікай, вытокі якой у фальклі. і біблейскіх вобразах, — непрыняцце тагачаснай рэчаіснасці, душэўная драма і пакуты чалавека 20 ст., трагізм венгерскай гісторыі, пратэст супраць сусв. вайны і адначасова вера ў ачышчальную сілу дэмакр. рэвалюцыі. У вершах традыцыі класічнай венг. паэзіі цесна перапляталіся з мадэрнісцкімі павевамі. Пасмяротны зб. «Апошнія караблі» (1923). На бел. мову асобныя яго вершы перакладалі М.Аўрамчык, М.Калачынскі, Ю.Свірка, Я.Семяжон, М.Хведаровіч.

*Тв.:* Рус. пер. — Стихи. М., 1975; [Стихи] // Венгерская поэзия, XX век. М., 1982.

**АДЗІНАБО́РСТВЫ ЎСХО́ДНІЯ**, усходнія баявыя ўмельствы, сучасныя азда-

Да арт. **Адзенне.** Партрэт Лізаветы Соф'і Радзівіл. Невядомы мастак. 1-я пал. 17 ст.

раўленчыя, спартыўныя і прыкладныя дысцыпліны. Сфарміраваліся ў канцы 19 — пач. 20 ст. на аснове стараж. сістэм ваен. падрыхтоўкі ў краінах Д.Усходу і Паўд.-Усх. Азіі. Тэхніка А.у. засн. на выкананні ўдараў рукамі ці нагамі, кідкоў, абарончых прыёмаў, уздзеянні на слабыя месцы цела і г.д. Некаторыя А.ў. (*дзюдо*, каратэ-до, *таэквандо*) прызнаны як *алімпійскія віды спорту*. На Беларусі з А.у. пашыраны дзюдо, каратэ-до, таэквандо, *ушу*. Ёсць асобныя групы *айкідо*, в'етводао, тайскага бокса і інш. Прадстаўнікі Беларусі ў А.у. перамагалі на чэмпіянатах свету, Еўропы і інш. міжнар. спаборніцтвах.

*А.Я.Вількін.*

**АДЗІНАНАЧА́ЛЛЕ**, 1) прынцып кіравання, які азначае наданне кіраўніку якога-н. органа, установы, прадпрыемства шырокіх паўнамоцтваў, неабхо-

Э.Адзі.

дных для выканання яго функцый, а таксама ўстанаўленне яго персанальнай адказнасці за вынікі працы. 2) А. ва ўзброеных сілах — прынцып кіравання войскамі, пры якім камандзіры (начальнікі) надзелены ўсёй паўнатой распарадчай улады ў адносінах да падначаленых, нясуць асабістую адказнасць за іх жыццё і дзейнасць. Заключаецца ў праве камандзіра асабіста прымаць рашэнні, аддаваць загады, забяспечваць іх выкананне. Ажыццяўляецца ў адпаведнасці з правамі, якія вызначаны законамі і рэгламентуюцца *статутамі воінскімі*.

**АДЗІНА́ЦЦАТАЯ КАНФЕРЭ́НЦЫЯ КП(б)Б**, гл. *Шосты з'езд КП(б)Б.*

**АДЗІНА́ЦЦАТЫ З'ЕЗД КП(б)Б.** Адбыўся 22—29.11.1927 у Мінску; 344 дэлегаты з рашаючым і 220 з дарадчым голасам, якія прадстаўлялі 23 735 чл. і 11 392 канд. у чл. партыі. Парадак дня: даклады аб рабоце ЦК і ЦКК ВКП(б), справаздачы ЦК, ЦКК і рэвіз. камісіі КП(б)Б; даклады аб асновах 5-гадовага плана развіцця нар. гаспадаркі БССР і СССР, аб рабоце ў вёсцы, аб выніках нац.-культ. будаўніцтва і паліт.-асв. работы; выбары кіруючых органаў КП(б)Б.

З'езд арыентаваў планавыя органы БССР на фарсіраванне тэмпаў індустрыялізацыі, у сельскай гаспадарцы — на выкарыстанне розных формаў кааперавання, развіццё калект. формаў пры далейшай інтэнсіфікацыі і павышэнні прадукцыйнасці працы. Рэлігія разглядалася як ідэалогія антысав. элементаў. У ажыццяўленні нац. палітыкі акцэнты зроблены на развіццё нац. культур і нар. адукацыі, беларусізацыі. Дагматызавана формула класавага (пралетарскага) інтэрнац. выхавання, што стварала глебу для сектанцкіх скажэнняў у адносінах да культ. спадчыны і нац. культуры.

*А.М.Малашка.*

**АДЗІНА́ЦЦАТЫ УСЕБЕЛАРУ́СКІ З'ЕЗД САВЕ́ТАЎ** рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў. Адбыўся 14—22.1.1935 у Мінску; 787 дэлегатаў з рашаючым і 180 з дарадчым голасам. Парадак дня: справаздача ўрада БССР; даклады аб стане і развіцці жывёлагадоўлі, стане і задачах аховы здароўя ў БССР.

Праходзіў ва ўмовах узмацнення культу асобы Сталіна і актыўнага складвання камандна-адм. сістэмы, што вяло да пэўнага адрыву рашэнняў з'езда ад жыцця, перабольшвання дасягнутых поспехаў, недаацэнкі цяжкасцяў і недахопаў. Паставіў нерэальную задачу перавыканаць план 2-й пяцігодкі. Сярод дасягненняў адзначаны адмена картачнай сістэмы на прадукты харчавання, канчатковая перамога калгаснага ладу ў рэспубліцы. З'езд звярнуў увагу на дрэнную работу большасці жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасных фермаў, ухваліў дзярж. план развіцця жывёлагадоўлі. Зроблены змены і дапаўненні да Канстытуцыі БССР, абвешчана абавязковая сіла пастаноў і заканадаўчых актаў СССР на тэр. Беларусі.

Выбраў ЦВК БССР (215 чл.), 72 дэлегаты на 7-ы з'езд Саветаў СССР і 5 прадстаўнікоў ад БССР у Савет нацыянальнасцяў ЦВК СССР. Старшынёй ЦВК БССР абраны А.Р.Чарвякоў, старшынёй СНК БССР — М.М.Галадзед. *М.П.Касцюк.*

**АДЗІНАЦЦАЦЫГАДО́ВАЯ ШКО́ЛА**, гл. ў арт. *Сярэдняя школа.*

**АДЗІНАЦЦАЦІСКЛАДО́ВІК**, вершавання форма з 11 складоў. У метрычным вершаскладанні вядомы А. алкееў (першыя 2 радкі *алкеевай страфы*), сапфічны (першыя 3 радкі *сапфічнай страфы*) і інш. У сілабічным вершаскладанні самы пашыраны памер, якім карысталіся ў санетах і паэмах, напісаных тэрцынамі і актавамі. Меў сталы націск на 10-м складзе і звычайна жаночую *клаўзулу*.

**АДЗІ́НАЯ СІСТЭ́МА ЭЛЕКТРО́ННЫХ ВЫЛІЧА́ЛЬНЫХ МАШЫ́Н** (АС ЭВМ), сям'я ЭВМ агульнага прызначэння малой, сярэдняй і вялікай прадукцыйнасці, якая характарызуецца праграмнай сумяшчальнасцю; адносіцца да 3-га пакалення *электронных вылічальных машын*. Пабудавана па модульным прынцыпе на аснове стандартнай сістэмы сувязяў паміж прыстасаваннямі. Распрацавана супольна краінамі — членамі СЭУ.

У склад перыферыйнага абсталявання ўваходзяць запамінальныя прыстасаванні на магн. барабанах (ёмістасць да 16 Мбайт), пастаянных магн. дысках (да 100 Мбайт), зменных магн. дысках (да 29 Мбайт), магн. стужках (да 40 Мбайт) і інш.; прыстасаванні ўводу-выводу інфармацыі на перфастужках, перфакартах, алфавітна-лічбавыя друкавальныя прыстасаванні, планшэтныя і рулонныя графапабудавальнікі; прыстасаванні непасрэднай сувязі чалавек—ЭВМ: алфавітна-лічбавыя і графічныя дысплеі, эл. друкавальныя машынкі і інш. Асобную групу складаюць прыстасаванні і прылады для падрыхтоўкі даных. Для стварэння выліч. сістэм калект. карыстання ў склад АС ЭВМ уключаны сродкі тэлеапрацоўкі і перадачы даных (мадэмы, прыстасаванні для аховы ад памылак, выклікальныя), прыстасаванні спалучэння каналаў з апаратурай перадачы даных, абаненцкія пункты (тэрміналы), забяспечаныя прыстасаваннямі ўводу-вываду інфармацыі і яе адлюстравання. На Мінскім вытв. аб'яднанні выліч. тэхнікі асвоены выпуск ЭВМ ЕС-1020 (1971), ЕС-1022 (1975), ЕС-1035 (1977), ЕС-1060 (1978). За распрацоўку, асваенне і ўкараненне аперацыйных сістэм АС ЭВМ супрацоўнікам Мінскага з-да выліч. машын і НДІ ЭВМ прысуджана Дзярж. прэмія СССР 1978.

**АДЗІ́НАЯ ТЭО́РЫЯ ПО́ЛЯ**, універсальная фіз. тэорыя мікрабудовы матэрыі, якая прызначана даць апісанне ўсіх *фундаментальных узаемадзеянняў*, вызначыць уласцівасці элементарных часціц і законы іх руху.

У аснове А.т.п. ляжаць агульныя палажэнні: 1) універсальнасць палявой канцэпцыі — кожнаму тыпу элементарных часціц і фундаментальных узаемадзеянняў адпавядаюць свае квантаварэлятывісцкія палі; 2) калібровачны (суперкалібровачны) прынцып як універсальны дынамічны прынцып для ўсіх тыпаў фундаментальных узаемадзеянняў — кожны з іх звязваецца з дынамічнай (калібровачнай) сіметрыяй і адказнымі за гэтае ўзаемадзеянне сілавымі зарадамі элементарных часціц, а таксама з адпаведнымі калібровачнымі палямі (базонамі) — іх пераносчыкамі; 3) гіпотэза аб існаванні адзінага універсальнага фундаментальнага ўзаемадзеяння (адзінага поля), канкрэтнымі праявамі якога пры адпаведных умовах з'яўляюцца гравітац., эл.-магн., слабае і моцнае ўзаемадзеянні. Пачатак А.т.п. пакладзены стварэннем адзінай калібровачнай палявой тэорыі *электраслабых узаемадзеянняў* (1967—68), першага аб'яднанага апісання двух тыпаў узаемадзеяння ў межах адной тэорыі. Пасля пабудовы квантавай хромадынамікі прапанаваны розныя схемы «Вялікага аб'яднання», адзінай калібровачнай палявой тэорыі эл.-магн., слабага і моцнага ўзаемадзеянняў. Уключэнне гравітацыйнага ўзаемадзеяння ў агульную схему дасягнута за кошт увядзення *суперсіметрыі* (што звязвае ферміёны і базоны) і адпаведных суперкалібровачных палёў (гл. *Супергравітацыя*).

На Беларусі даказана магчымасць пабудовы тэорыі ўсіх фундаментальных узаемадзеянняў з дапамогай універсальных нелінейных ураўненняў Фёдарава для аб'яднаных палёў (1968; Ф.І.Фёдараў).

*Літ.:* Физика микромира. М., 1980; Фёдоров Ф.И. Уравнения первого порядка для гравитационного поля // Докл. АН СССР. 1968. Т. 179, № 4; Богуш А.А. Введение в калибровочную полевую теорию электрослабых взаимодействий. Мн., 1987.

*А.А.Богуш.*

**АДЗІ́НАЯ ЭНЕРГЕТЫ́ЧНАЯ СІСТЭ́МА**, энергетычныя аб'екты (электрастанцыі, падстанцыі, лініі электраперадач, цеплавыя сеткі, кацельныя), звязаныя агульным рэжымам у бесперапынным працэсе вытв-сці, ператварэння і размеркавання эл. і цеплавой энергіі. На тэр. б. СССР фарміраванне пачалося ў 1956—59. Да пач. 1990-х г. завершана падключэнне большай ч. *аб'яднанай электраэнергетычнай сістэмы* да агульнай сеткі ліній электраперадач напружаннем 220, 330, 500 і 750 кВ. У 1991 А.э.с. аб'ядноўвала 92 энергет. сістэмы (выраблена каля 1490 млрд. кВт·гадз электраэнергіі). На пач. 1992 магутнасць 790 электрастанцый А.э.с. складала больш за 288 тыс. МВт. *Беларуская энергетычная сістэма* тэхналагічна ўваходзіць у паўн.-зах. рэгіён А.э.с. б. СССР і звязана лініямі з Літоўскай, Смаленскай, Пскоўскай, Бранскай і Украінскай энергасістэмамі.

*А.У.Вержбаловіч.*

**АДЗІ́НКА**, 1) найменшы з натуральных лікаў n = 1. Пры множанні адвольнага ліку на 1 атрымліваецца той жа самы лік. 2) Элемент e мноства M наз. А. у адносінах да бінарнай алг. аперацыі *, калі для адвольнага элемента a мноства M выконваецца роўнасць a * e = a, або e * a = a (абедзве роўнасці незалежныя, г. зн., што ў агульным выпадку a * в ≠ в * a). Адрозніваюць левыя і правыя А.: a * $e_п$ = a і $e_л$ * a = a. Калі на мноства M вызначана некалькі бінарных аперацый (напр., множанне і складанне лікаў), то e наз. А. толькі ў адносінах да множання, у адносінах да складання — нулём.

**АДЗІ́НКАВАЕ**, асобнае, індывідуальнае, філасофская катэгорыя, якая адлюстроўвае існаванне аднасна асобных у прасторы і часе рэчаў, з'яў, працэсаў з індывід. якаснай і колькаснай акрэсленасцю. Выяўляе тое, што ўласціва толькі гэтаму *аб'екту* і адрознівае яго ад іншых. У якасці А. можа разглядацца не толькі асобны прадмет, яго ўласцівасці ці прыкмета, але і цэлы іх клас, калі яны бяруцца як нешта адзінае. А. непарыўна звязана з *агульным*. Любая рэч індывідуальная ў параўнанні з іншымі, разам з тым у пэўных адносінах валодае агульнымі з імі ўласцівасцямі. Улік катэгорыі А. ў метадалогіі *пазнання* праяўляецца ў пераходзе ад адзінкавага праз *асаблівае* да агульнага, заканамернага. *А.А.Лазарэвіч.*

**АДЗІ́НКАВЫ ВЕ́КТАР**, орт, вектар, даўжыня якога прынята за адзінку выбранага маштабу. Адвольны вектар $\vec{a}$ можна атрымаць з якога-н. калінеарнага яму А.в. $\vec{e}$ множаннем на лік (скаляр) $\lambda : \vec{a} = \lambda\vec{e}$. Гл. таксама *Вектарнае злічэнне.*

**АДЗІ́НКАВЫХ ПАХАВА́ННЯЎ КУЛЬТУ́РЫ**, агульная назва археал. культур, плямёны якіх з'явіліся ў Паўн. Германіі і Скандынавіі ў познім неаліце (2,5—2 тыс. г. да н.э.), а ў пач. бронзавага веку праніклі ў Прыбалтыку і на ПнЗ Беларусі (гл. *Прыбалтыйская культура*). Назва ад характэрных пахаванняў з адным нябожчыкам. Асн. заняткі насельніцтва — жывёлагадоўля і земляробства. Пахавальны абрад — курганныя трупапалажэнні (на гарызонце, у насыпе, яме). Пашыраны каменныя баявыя сякеры і гліняны посуд, арнаментаваны

адбіткамі шнура; гэта звязвае А.п.к. з комплексам *шнуравой керамікі культур.*

**АДЗІ́НКІ ФІЗІ́ЧНЫХ ВЕЛІЧЫ́НЯЎ**, фізічныя велічыні, якім паводле вызначэння прысвоена лікавае значэнне, роўнае адзінцы. Перадаюцца *мерамі* і захоўваюцца ў выглядзе *эталонаў.*

Гістарычна першымі з'явіліся А.ф.в. для вымярэння даўжыні, масы (вагі), часу, плошчы, аб'ёму. Выбраныя адвольна, яны садзейнічалі ўзнікненню ў розных краінах аднолькавых па назве і розных па памеры адзінак (напр., *аршын, валока, гарнец, пуд, фут, цаля* і інш.). Развіццё навукі і тэхнікі, эканам. сувязяў паміж краінамі патрабавала уніфікацыі адзінак. У 18 ст. ў Францыі прынята *метрычная сістэма мер*, на яе аснове пабудаваны метрычныя сістэмы адзінак. Упарадкаванне А.ф.в. праведзена на аснове *Міжнароднай сістэмы адзінак* (СІ). Даўнія меры і А.ф.в. вывучае *метралогія гістарычная.*

А.ф.в. падзяляюцца на сістэмныя, што ўваходзяць у пэўную *сістэму адзінак*, і *пазасістэмныя адзінкі.* Сярод сістэмных адрозніваюць асноўныя, якія выбіраюцца адвольна (напр., *ампер, секунда* і інш.), вытворныя, што ўтвараюцца пры дапамозе ўраўненняў сувязі паміж *фізічнымі велічынямі* (напр., метр у секунду, кілаграм на кубічны метр і інш.), і дадатковыя (напр., *радыян*). У СІ 17 вытворных адзінак маюць спец. найменні: *бекерэль, ват, вебер, вольт, генры, герц, грэй, джоўль, кулон, люкс, люмен, ньютан, ом, паскаль, сіменс, тэсла, фарад.* Вельмі вял. ці малыя лікавыя значэнні фіз. велічыняў для зручнасці перадаюць *кратнымі адзінкамі* і *дольнымі адзінкамі.*

*Літ.:* Деньгуб В.М., Смирнов В.Г. Единицы величин: Слов.-справ. М., 1990; Сена Л.А. Единицы физических величин и их размерности. 3 изд. М., 1988; Болсун А.И., Вольштейн С.Л. Единицы физических величин в школе. Мн., 1983.

*А.І.Болсун.*

**АДЗІНО́ТА**, адзіноцтва, адзін з псіхагенных фактараў, сац.-псіхал. стан ізаляцыі чалавека ад інш. людзей. Выклікаецца геагр. (тэрытарыяльнай), сац., турэмнай, псіхал. ізаляцыяй. А. спадарожнічаюць вострыя, часцей негатыўныя эмацыянальныя перажыванні, стрэсавая сітуацыя, псіхал. шок. Фізічна адзінокі індывід, звязаны з нейкімі ідэямі, маральнымі каштоўнасцямі і інш., адчувае прыналежнасць да пэўнай сац. групы, грамадства і г.д. Разам з тым індывід можа жыць сярод людзей, але адчуваць поўную ізаляванасць; такі стан — аснова для ўзнікнення шызафрэнічнага стрэсу. Адсутнасць сувязяў з духоўнымі каштоўнасцямі, нормамі, сімваламі выступае як маральная А., з сац. наваколлем — сацыяльная. Фізічная А. ўзмацняецца, калі ёй спадарожнічае маральная ці псіхалагічная. Маральная А. становіцца адметнай рысай грамадства, у якім разбураецца таталітарны калектывізм і людзі атрымліваюць свабоду самавызначэння, не маючы для гэтага ні імкнення, ні звычак. Аднак побач з А., якая носіць негатыўны характар, існуе і А., якая лечыць, дапамагае асобе больш поўна раскрыць свае здольнасці, талент, своеасаблівасць.

*Літ.:* Швалб Ю.М., Данчева О.В. Одиночество. Киев, 1991; Фромм Э. Бегство от свободы: Пер. с англ. М., 1990.

*Я.М.Бабосаў.*

**АДЗІ́НСТВА І БАРАЦЬБА́ ПРАЦІЛЕ́ГЛАСЦЯЎ**, адзін з асн. законаў дыялектыкі, што раскрывае ўнутраную крыніцу і рухаючыя сілы развіцця. Выяўляе пэўныя дачыненні паміж бакамі, момантамі, тэндэнцыямі ўнутры любой з'явы, якія знаходзяцца ў адносінах узаемасувязі, узаемадапаўнення, узаемадапускання, узаемаразумення, узаемаадмаўлення. Такія адносіны паміж процілегласцямі, што адначасова характарызуюцца ўзаемадапаўненнем і ўзаемаадмаўленнем, наз. супярэчнасцю. Калі б процілегласці толькі ўзаемавыключалі адна адну, але не знаходзіліся ў арганічным адзінстве, такія адносіны маглі б служыць толькі кароткачасовым імпульсам, штуршком да змены. Калі паміж імі існавала б толькі адзінства, гармонія і не было ўзаемавыключэння, не было б і стымулу, імкнення да развіцця. Але паколькі процілегласці адначасова ўзаемавыключаюць і ўзаемадапускаюць адна адну, ствараецца ўнутранае напружанне, стан неспакою, пры якім узаемавыключальныя бакі не могуць разысціся і вымушаны ўзаемадзейнічаць, што стварае пастаянны імпульс развіцця. Адносіны процілегласцяў у супярэчанні не статычныя, а дынамічныя і імкнуцца рэалізавацца, выйсці за свае межы, перайсці ў новую якасць, што і з'яўляецца пастаянна дзеючай крыніцай развіцця. Узаемадапусканне і ўзаемавыключэнне процілегласцяў з'яўляюцца неабходнай умовай супярэчнасці, але формы ўзаемадапускання і ўзаемавыключэння могуць быць розныя на розных этапах развіцця супярэчнасці.

*Літ.:* Материалистическая диалектика как общая теория развития. М., 1987; Горбач В.И. Проблемы диалектических противоречий. М., 1972; Закон единства противоположностей. Киев, 1991.

*А.І.Осіпаў.*

**АДЗІ́НСТВА І РАЗНАСТА́ЙНАСЦЬ СВЕ́ТУ**, адна з асноватворных светапоглядных праблем, якая вырашаецца з пазіцый манізму, дуалізму і плюралізму. Манізм прымае за аснову ўсяго існага адзін пачатак. Матэрыялістычны манізм бачыць пачатак свету ў яго матэрыяльнасці (усе прадметы і з'явы — розныя віды ці ўласцівасці матэрыі, якая рухаецца). Наяўнасць структурных узроўняў матэрыі, на кожным з якіх яна валодае рознай будовай і падпарадкоўваецца спецыфічным законам руху, лічыцца крыніцай разнастайнасці свету. Ідэалістычны манізм звязвае адзінства свету з агульнасцю яго духоўнага пачатку. У Гегеля пачатак, які складае аснову ўсіх з'яў прыроды і гісторыі, прадстаўлены абсалютнай ідэяй. Дуалізм у поглядах на свет заключаецца ў прызнанні яго першапачаткам дзвюх раўнапраўных субстанцый: матэрыяльнай і духоўнай. Дэкартаўская (картэзіянская) карціна свету выцякае з паралельнага існавання цялеснай (працяглай) і мыслячай субстанцый (дуалізм цела і душы). Адзінкавыя прадметы — гэта модусы (часовы стан) працягласці і мыслення. Плюралізм грунтуецца на тым, што свет складаецца з мноства незалежных, раўнапраўных утварэнняў, якія не зводзяцца да адзінага пачатку. Паводле Лейбніца, субстанцыяльнымі адзінкамі прыроды з'яўляюцца манады — непадзельныя, замкнутыя духоўныя істоты; вышэйшай манадай ён лічыў Бога.

*Літ.:* Гегель Г.В.Ф. Энциклопедия философских наук. Т. 1. Наука логики. М., 1974; Декарт Р. Первоначала философии // Соч. М., 1989. Т. 1; Лейбниц Г.В. Монадология // Соч. М., 1982. Т. 1; Кучевский В.Б. Философские проблемы естествознания. М., 1985.

*А.В.Рубанаў.*

**АДЗІНЦО́Ў** (Адзінец) Лявонцій Яфімавіч (14.7.1891, г.п. Акцябрскі Гомельскай вобл. — 3.2.1943), адзін з арганізатараў *Мінскага патрыятычнага падполля* ў Вял. Айч. вайну. У 1917 арганізатар чырвонагв. атрадаў у Рудобелцы Бабруйскага пав., камандзір партыз. атрада (1919—20). З 1921 у павятовых установах Бабруйска, на кіруючых пасадах у ЦВК БССР. У Вял. Айч. вайну на яго кватэры праводзіліся пасяджэнні Мінскага падп. гаркома КП(б)Б, хавалася зброя, нелегальная л-ра, медыкаменты. 24.10.1942 арыштаваны, спалены ў лагеры смерці Трасцянец.

**АДЗІНЦЭ́ВІЧЫ,** Адынцэвічы, старажытны княжацкі род герба «Адынец» у ВКЛ. Верагодна, з нашчадкаў *Рурыкавічаў*, хоць іх уласны радавод у Супрасльскім рукапісе прыпісвае родапачынальніку Івану Адынцу паходжанне «ад немцаў». У 15—16 ст. А. валодалі часткай Друцкага княства з маёнткамі Багрынава, Гольцава, Рэпухава, Шыйкі, а таксама Нястанавічамі ў Менскім пав. Вызнавалі праваслаўе. Значнай ролі ў паліт. жыцці не адыгрывалі.

У 1432 упамінаецца Фёдар Андрэевіч як прыхільнік Свідрыгайлы. Ад трох яго сыноў пайшлі асобныя лініі А.: гольцаўская (згасла ў пач. 16 ст.), багрынаўская (верагодна, згасла ў пач. 17 ст.) і дзярэчынская (найб. значная). Прадстаўнік апошняй Сямён Багданавіч (? — 1542), староста любашанскі (1536), праз шлюб з княжной Н.М.Сангушкаўнай набыў частку Дзярэчына ў Слонімскім пав. Яго сын Андрэй (? — 1566), ротмістр каралеўскі (1555), маршалак і староста аршанскі (1559), памёр без нашчадкаў.

На працягу 17—19 ст. вядомы шляхецкія роды з прозвішчамі А. і Адынец. Яны, найб. верагодна, не маюць дачынення да княжацкага роду А.

*В.Л.Насевіч.*

**АДЗНА́КА**, 1) метка, знак, пастаўленыя, каб абазначыць што-н., паказаць на што-н. 2) Знак, прыкмета, акалічнасць,

паводле якіх можна пазнаць, вызначыць што-н. 3) Асаблівасць, рыса, якімі асоба, прадмет адрозніваюцца ад іншых асоб, прадметаў і інш. 4) Агульнапрынятая ацэнка ступені ведаў і паводзін навучэнцаў. 5) Ганаровы знак, ордэн, медаль і інш.

**АДЗЫЎНА́Я ГРА́МАТА**, дакумент аб адкліканні ўрадам свайго дыпламат. прадстаўніка ў замежнай дзяржаве. Падпісваецца кіраўніком дзяржавы, што прызначыла дыпламат. прадстаўніка, і накіроўваецца кіраўніку дзяржавы, пры якой ён акрэдытаваны.

**АДЗЮЛЬТЭ́Р** (франц. adultère), нявернасць (здрада) мужа, жонкі.

**АДЗЯРЫ́ХА** Уладзімір Сцяпанавіч (н. 15.11.1937, в. Горкі Слуцкага р-на Мінскай вобл.), бел. вучоны-геабатанік. Канд. біял. н. (1971). Скончыў Бел. лесатэхнічны ін-т (1960). З 1964 у Ін-це эксперым. батанікі АН Беларусі. Навук. працы па біягеацэналогіі, лесазнаўстве (аднаўленне, ахова і рацыянальнае выкарыстанне лясоў), адзін са стваральнікаў серыі спец. геабат. картаў расліннасці Беларусі. Дзярж. прэмія Беларусі 1972.

*Тв.:* Растительность Белоруссии, ее картографирование, охрана и использование. Мн., 1979 (разам з І.Д.Юркевічам, Д.С.Голадам); Липняки Белоруссии. Мн., 1988 (разам з І.Д.Юркевічам, В.Л.Дольскім).

**АДКА́ЗНАСЦЬ**, катэгорыя, якая выражае свядомыя адносіны сац. груп або асобы да патрабаванняў грамадства, яго нормаў і каштоўнасцяў. У адпаведнасці са сферамі праяўлення адрозніваюць паліт., маральную, юрыдычную і інш. А.; у залежнасці ад яе носьбіта — індывідуальную (асабістую) і калектыўную. У індывіда А. фарміруецца як вынік яго здольнасці вызначаць свой спосаб існавання і паводзін. Перадумовай асабістай А. ў філасофіі лічыцца адзінства чалавечай жыццядзейнасці і неабходнасці апасродкавання ўздзеяння свядомасцю і выбарам самога індывіда. Таму чалавек здольны самавызначацца ў адносінах да свайго сучаснага і мінулага жыцця, быць «аўтарам» сваіх дзеянняў і ўчынкаў, г. зн. браць А. за іх на сябе; ён усталёўвае ў рэальнасці пэўны парадак маральнасці, свабоды і належнага існавання, якія не залежаць ад наяўных умоў. *Т.М.Тузава.*

**АДКА́ЗНАСЦЬ** юрыдычная, у шырокім сэнсе — пакаранне; прымусовыя меры ў адносінах да вінаватых (фізічных і юрыд. асоб) за правапарушэнні, якія прадугледжаны і рэгулююцца нормамі права. Адрозніваюць А. адміністрацыйную, дысцыплінарную, цывільную, крымінальную і інш.

Адміністрацыйная — А. за *адміністрацыйныя правапарушэнні.* Настае за ўчыненне антыграмадскіх дзеянняў, якія не маюць вял. грамадскай небяспекі. Адм. спагнанні накладваюць органы ўнутр. спраў, адм. камісіі, суддзі і інш. Дысцыплінарная — А. за парушэнні працоўнай дысцыпліны і службовых абавязкаў. Агульны парадак такой А. вызначаны КЗаП, тыпавымі правіламі ўнутр. працоўнага распарадку, статутамі і палажэннямі аб службе або рабоце. Дысцыплінарныя спагнанні накладваюцца адпаведнымі органамі ці кіраўніком (начальнікам), якому парушальніх падпарадкоўваецца па службе або рабоце. Цывільная — А. за маёмасныя (і некаторыя немаёмасныя) страты, нанесеныя невыкананнем або неналежным выкананнем абавязацельстваў або ўчыненнем якіх-н. процілраўных дзеянняў. Выяўляецца ва ўскладанні нявыгадных маёмасных вынікаў на асобу, якая дапусціла неправамерныя паводзіны. Найб. пашыраныя формы гэтага віду А. — кампенсацыя страт і выплата *няўстойкі.* Забяспечваецца ва ўстаноўленым судом парадку. Крымінальная — А. за злачынствы. Падставай для яе з'яўляецца факт учынення небяспечнага для грамадства дзеяння, якое вызначаецца законам як *злачынства.* Мера пакарання вінаватаму назначаецца прыгаворам суда. Парадак прыцягнення да крымін. А., а таксама магчымасць вызвалення ад яе рэгламентаваны заканадаўствам.

Прававыя нормы Рэспублікі Беларусь прадугледжваюць таксама матэрыяльную А. — абавязак работніка пакрыць прадпрыемству (установе, арг-цыі) матэрыяльныя страты, якія атрымаліся па яго віне. Падставы для матэрыяльнай А., парадак і памеры кампенсавання страт вызначаюцца заканадаўствам.

Сучаснае міжнар. права прадугледжвае міжнародна-прававую А., суб'ектам якой з'яўляецца сама дзяржава. Настае ў выніку парушэння дзяржавай нормаў міжнар. права ці міжнар. абавязацельстваў. Дзяржава нясе таксама адказнасць за неправамерныя дзеянні або ўпушчэнні ўсіх сваіх органаў і дзеянні фізічных асоб, учыненыя на яе тэрыторыі. Адрозніваюць А. палітычную (ужыванне міжнар. санкцый і аддаванне задавальнення пацярпелай дзяржаве) і матэрыяльную (*рэпарацыі* і *рэстаўрацыі*). Рознагалоссі ў вызначэнні формаў і аб'ёмаў А. вырашаюцца мірнымі сродкамі, прадугледжанымі Статутам ААН. Найчасцей у такіх выпадках выкарыстоўваецца *арбітраж міжнародны.* Калі дзяржава-парушальнік адмаўляецца ад выканання мер кампенсацыі або задавальнення, не пагаджаецца на мірнае ўрэгуляванне рознагалоссяў ці не выконвае рашэння кампетэнтнага міжнар. органа, могуць быць ужыты адпаведныя міжнар. санкцыі.

**АДКА́ЗЧЫК**, бок цывільнай справы ў судзе або спрэчкі ў гасп. судзе, якому прад'яўлена патрабаванне *істца.* Паводле бел. права А. можа быць грамадзянін, а таксама прадпрыемства, арг-цыя, установа, якія з'яўляюцца юрыд. асобамі; у гасп. судзе А. — толькі юрыд. асобы. Становішча А. ў судзе, яго працэсуальныя правы і абавязкі прадугледжаны цывільным і гасп. працэсуальным заканадаўствамі. У крымін. працэсе магчымы ўдзел А., калі ён нясе матэрыяльную адказнасць за шкоду, прычыненую *абвінавачаным.*

*І.І.Пацяружа.*

**АДКО́РМ** сельскагаспадарчых жывёл, тэхналагічны працэс у прамысл. жывёлагадоўлі, які забяспечвае атрыманне найб. колькасці высакаякаснага мяса за адносна кароткі перыяд. Адкормліваюць буйную рагатую жывёлу, свіней, авечак, трусоў, а таксама птушак. Віды А. залежаць ад патрабаванняў да мясной прадукцыі.

Угадоўлі буйной рагатай жывёлы найб. пашыраная і эфектыўная тэхналогія атрымання высакаякаснай маладой ялавічыны — А. маладняку з 6—8-месячнага ўзросту да 15—20 мес, калі жывёла дасягае жывой масы 400—480 кг і больш. Сярэднясутачныя прыбаўкі ў вазе на А. 800—1200 г і больш. Затраты корму на 1 кг прыбаўкі ў вазе 8—11 кармавых адзінак. Тыпы А. ў свінагадоўлі: мясны (пераважае), беконны і А. да тлустых кандыцый. На мясны А. ставяць парасят масай 15—16 кг ва ўзросце 2,5 мес, заканчваюць у 7—7,5 мес пры масе 100—110 кг (таўшчыня сала супраць 6—7-га рэбраў 1,5—4 см). Сярэднясутачны прырост складае 500—600 г, затрата корму на 1 кг прыбаўкі ў вазе 4,5—5 кармавых адзінак. Удзельная вага канцэнтратаў у рацыёнах 60—80%, сакаўных кармоў — 15—25%. У авечкагадоўлі найб. эфектыўны А. маладняку мясавоўнавых парод і мяшанцаў ад прамысл. скрыжавання матак танкарунных парод з баранамі мясавоўнавых паўтанкарунных парод. Пачынаюць пасля адымання ягнят ад матак, заканчваюць у 7—8-месячным узросце. У птушкагадоўлі пераважае спец. А. бройлераў і птушак, вылучаных з розных гасп. груп (рамонтнага маладняку, бацькоўскага статка ва ўзросце 2—6 мес і выбракаванай птушкі). Тэрмін А. 15—25 сутак, расход корму на 1 кг прыбаўкі ў вазе 6—9 кармавых адзінак.

**АДКРЫ́ТАЕ МО́РА**, у міжнародным праве частка Сусв. акіяна па-за межамі тэр. водаў якой-н. дзяржавы. Знаходзіцца ў агульным карыстанні ўсіх краін, на яго не распаўсюджваецца ўлада прыбярэжных дзяржаў, і судны падпарадкоўваюцца толькі краіне, пад сцягам якой яны плаваюць.

**АДКРЫ́ТАЯ РАСПРАЦО́ЎКА РАДО́ВІШЧАЎ** карысных выкапняў, спосаб здабычы карысных выкапняў непасрэдна з паверхні зямлі. Ажыццяўляецца з вырабатак — кар'ераў. Складаецца з падрыхтоўкі паверхні, асушэння радовішчаў, горна-капітальных, раскрыўных і здабыўных работ. Падрыхтоўка паверхні звязана з ліквідацыяй перашкод, якія ўскладняюць А.р.р. (планіроўка паверхні, выдаленне расліннасці і г.д.). Асушэнне радовішчаў — комплекс мерапрыемстваў для аховы радовішчаў ад прытоку вады, у т.л. шляхам адпампоўвання і водапаніжэння. Горна-капітальныя работы — пабудова капітальных траншэй для трансп. камунікацый кар'ера, разразных траншэй для першапачатковай работы і расстаноўкі абсталявання (экскаватараў, гідраманіторaў і інш.), капітальнае раскрыццё першапачатковага агалення карыснага выкапня. Раскрыўныя работы — аддзяленне ад масіву і

транспарціроўка ў *адвалы* покрыўных пород. Здабыўныя работы — працэс непасрэднага выбірання карыснага выкапня з горнага масіву. А.р.р. забяспечвае здабычу каля 75% цвёрдых карысных выкапняў, у тым ліку да 100% прыродных буд. матэрыялаў, 75—80% бурага вугалю, 65—75% нярудных, 45—50% рудных выкапняў, большасць рассыпных карысных выкапняў. Прадукцыйнасць працы ў кар'ерах у 2—6 разоў вышэйшая, чым у шахтах, вытв. магутнасць у 3—5 разоў большая, буд-ва іх у 2—5 разоў хутчэйшае. На Беларусі А.р.р. выкарыстоўваецца пры здабычы прыродных буд. матэрыялаў (буд. і абліцовачнага каменю, буд. пяску і пясчана-жвіровых матэрыялаў, сыравіны для керамічнай цэглы, лёгкіх запаўняльнікаў, шкла і цэменту, мелу і інш.). Дзейнічаюць буйнейшыя ў Еўропе кар'еры па здабычы даламітаў (радовішча Гралева ў Віцебскай вобл.) магутнасцю 6 млн. т у год, гранітаў (радовішча Мікашэвічы ў Брэсцкай вобл.) магутнасцю каля 5 млн. м$^3$ у год і інш.

*П.З.Хоміч.*

**АДКРЫ́ТЫ ГО́РАД**, у міжнародным праве горад, які ў вайну адна з дзяржаў, што ваююць, абвяшчае неабароненым (без ваен. аб'ектаў, войскаў і сродкаў абароны) і таму па-за тэатрам ваенных дзеянняў. Гэты акт мае на мэце прадухіліць знішчэнне гіст. і культ. каштоўнасцяў горада, яго жыхароў.

Прававы статус А.г. засн. на палажэнні (Гаагскай канвенцыі 1907) «Аб законах і звычаях сухапутнай вайны», арт. 25 якога забараняе «атакаваць або бамбардзіраваць якім бы ні было чынам неабароненыя гарады, паселішчы, жылыя дамы або будынкі». У 2-ю сусв. вайну А.г. абвяшчаліся Парыж, Рым, Брусель, Бялград, Заграб, Любляна і інш. Вядомы выпадкі парушэння статуса А.г. (бамбардзіроўка Бялграда фаш. авіяцыяй у 1941).

**АДКРЫ́ТЫ ГРУНТ**, зямельныя ўчасткі без укрыццяў для вырошчвання агародніны або дэкар. раслін. У А.г. насенне холадаўстойлівых раслін (з сям. парасонавых, крыжакветных, а таксама буракоў, салаты, шпінату, гароху) высяваюць ранняй вясной, як толькі паспее глеба, пры сярэднясутачнай т-ры 1—5 °С, насенне цеплалюбівых раслін (з сям. гарбузовых, паслёнавых, а таксама фасолі, кукурузы) — пры т-ры 10—15 °С; расаду высаджваюць пры сярэднясутачнай т-ры адпаведна 5—10 і 15 °С, пасля заканчэння веснавых замаразкаў. На Беларусі ў А.г. вырошчваюць каля 98% агародніны і кветак. Гл. таксама *Хаваны грунт*.

**АДКРЫ́ТЫ ЛІСТ**, 1) дакумент на права правядзення даследчыкамі археал. разведак і раскопак. Выдаецца навук. ўстановамі. На Беларусі першы А.л. (грамату) атрымаў 14.12.1818 А.Чарноцкі (З.Я.*Даленга-Хадакоўскі*) за подпісам рэктара Віленскага ун-та. З 1992 наз. дазвол. 2) Дакумент, які выдаецца ведамствам замежных спраў або дыпламат. прадстаўніцтвам іншаземцу, што карыстаецца дыпламат. прывілеямі і імунітэтам або з'яўляецца госцем краіны. Адрасаваны мытнай і пагранічнай службе сваёй краіны з просьбай садзейнічаць уладальніку А.л. ў час яго пераезду праз граніцу. Асобы, якія маюць А.л., як правіла, вызваляюцца ад мытнага дагляду.

**АДКРЫ́ТЫ РЫ́НАК**, продаж і купля цэнтр. банкам каштоўных папер, каб уздзейнічаць на масу грошай у абарачэнні і аб'ём крэдытаў. Аперацыя ажыццяўляецца пераважна з каротказтэрміновымі ўрадавымі каштоўнымі паперамі, а часам з сярэдне- і доўгатэрміновымі паперамі. Пры куплі ўкладанне сродкаў у эканоміку павялічваецца, у выніку расце і аб'ём крэдытаў. Ад продажу эфект адваротны.

**АДКРЫ́ТЫЯ ДАГАВО́РЫ**, двухбаковыя і шматбаковыя міжнар. пагадненні, да якіх могуць далучацца і інш. дзяржавы. Адрозніваюць рэгіянальныя і агульныя А.д. універсальнага характару. Да першых могуць далучацца дзяржавы пэўнага геагр. рэгіёна, да другіх — любая дзяржава. Умовы далучэння вызначаюцца ў дагаворы.

**АДКРЫ́ТЫЯ І ЗАКРЫ́ТЫЯ МНО́СТВЫ** ў матэматыцы, класы мностваў (гл. *Мностваў тэорыя*). Мноства наз. адкрытым (АМ), калі яно разам з кожным сваім пунктам змяшчае ў сабе і некаторае яго наваколле, і замкнутым (ЗМ) — калі змяшчае ў сабе ўсе свае межавыя пункты. Напр., інтэрвал на прамой — АМ, адрэзак — ЗМ. Перасячэнне канечнага ліку і аб'яднанне любога ліку АМ з'яўляюцца АМ. Аб'яднанне канечнага ліку і перасячэнне любога ліку ЗМ будуць ЗМ. АМ можна разглядаць у эўклідавай прасторы любога ліку вымярэнняў, у адвольных метрычных і тапалагічных прасторах. Азначэнне ЗМ захоўваецца для мностваў у адвольных метрычных і тапалагічных прасторах.

**АДКРЫ́ТЫЯ СІСТЭ́МЫ**, *тэрмадынамічныя сістэмы*, якія абменьваюцца рэчывам (энергіяй і імпульсам) з навакольным асяроддзем. Да А.с. адносяцца хім. і біял. сістэмы (у т.л. і жывыя арганізмы), у якіх бесперапынна працякаюць хім. рэакцыі за кошт паступлення вонкавых рэчываў, а прадукты рэакцый выдаляюцца. У адрозненне ад замкнутых (ізаляваных) сістэм у А.с. немагчыма *раўнавага тэрмадынамічная*, аднак яны могуць знаходзіцца ў стацыянарных станах, якія характарызуюцца пастаянствам скарасцей хім. рэакцый, пераносу рэчыва і энергіі, а таксама мінім. прыростам *энтрапіі*.

**А́ДЛЕР**, курортны пасёлак у Расіі, у Краснадарскім краі. Размешчаны на Чарнаморскім узбярэжжы Каўказа, у даліне р. Мзымта. Прыморскі кліматычны курорт. Чыг. станцыя. Аэрапорт. Харч. прам-сць.

**А́ДЛЕР** (Adler) Альфрэд (7.2.1870, Вена — 28.5.1937), аўстрыйскі ўрач-псіхіятр, заснавальнік сістэмы індывідуальнай псіхалогіі. З 1930-х г. жыў пераважна ў ЗША. У аснове яго вучэння прынцып унутр. адзінства псіхічнага жыцця асобы, адсутнасці трывалай мяжы і антаганізмаў паміж свядомасцю і бессвядомым. У тлумачэнні паводзін асобы апіраўся на разуменне канчатковай мэты, да якой імкнецца чалавек, падпарадкоўваючы ёй свае псіхічныя праявы. Паводле А., асн. рухаючай сілай развіцця асобы з'яўляецца імкненне да паўнаты і асабістай перавагі, якое рэалізуецца праз механізм кампенсацыі першаснага пачуцця непаўнацэннасці. Зрабіў уклад у распрацоўку праблем псіхапаталогіі, тэорыі сноў, вывучэння сац. фактараў уздзеяння на чалавечую псіхіку. Асн. працы: «Аб непаўнацэннасці органаў» (1907), «Аб нервовым характары» (1912), «Тэорыя і практыка індывідуальнай псіхалогіі» (1920), «Чалавеказнаўства» (1928), «Сэнс жыцця» (1933) і інш.

**Схема адкрытай распрацоўкі радовішча:** 1 — кар'ер; 2 — капітальная траншэя; 3 — разразная траншэя; 4 — нахіленая выпрацоўка для транспарціроўкі карыснага выкапня; 5 — адвал пустых парод.

**А́ДЛЕР** (Adler) Гвіда (1.11.1855, Іванчыцэ, Славакія — 15.2.1941), аўстрыйскі музыказнавец; адзін з заснавальнікаў сучаснага музыказнаўства. Асн. працы па метадалогіі гісторыі музыкі, тэорыі муз. стыляў, эстэтыцы. Удзельнічаў у выданні «Квартальніка музычнай навукі» (з 1884) і серыі «Помнікі музычнага мастацтва ў Аўстрыі» (1894—1938). Адзін з заснавальнікаў Акадэмічнага вагнераўскага т-ва (1870-я г.) і ініцыятараў стварэння *Міжнароднага таварыства музыказнаўства*, з 1927 яго ганаровы старшыня.

**А́ДЛЕР** (Adler) Фрыдрых (9.7.1879, Вена — 2.1.1960), адзін з лідэраў аўстрыйскіх сацыял-дэмакратаў і тэарэтыкаў аўстрамарксізму. Па адукацыі фізік. У 1911—16 сакратар аўстр. с.-д. партыі. 21.10.1916 застрэліў аўстр. прэм'ера К.Шцюргка; прыгавораны да пакарання смерцю (заменена на 18 гадоў зняволення). У час рэвалюцыі ў Аўстрыі амнісціраваны (1918), кіраваў рабочымі саветамі (да 1919). Дэпутат аўстр. парламента (1919—23). Ген. сакратар 2 1/2 Інтэрнацыянала (1921—23) і Сацыялістычнага рабочага інтэрнацыянала (1923—40). У 1940 эмігрыраваў у ЗША, з 1946 жыў у Цюрыху.

**А́ДЛЕРФЕЛЬТ** (Adlerfelt) Густаў (1671—9.7.1709), шведскі прыдворны. Вучыўся ва ун-тах Упсалы (Швецыя), Гале (Германія), падарожнічаў па краінах Еўропы. З 1700 гофюнкер, з 1701 пры двары Карла XII, суправаджаў яго ў паходах. Удзельнік Паўн. вайны 1700—21. Загінуў у баі пад Палтавай. Вёў дзённік ваен. падзей, у т.л. на Беларусі, дапаўняў яго афіц. дакументамі, інш. крыніцамі. Часткова надрукаваны (ананімна) у 1707 у Гамбургу, дапрацаваны сынам, выдадзены на франц., англ. і ням. мовах (1740—42); у арыгінале выдадзены ў 1919.

*В.П.Грыцкевіч.*

**АДЛІ́ГА**, павышэнне т-ры паветра да 0 °С і вышэй зімой ва ўстойлівы марозны перыяд. Узнікае ад прытоку паветра з больш цёплых раёнаў (гл. *Адвекцыя, Цыклон*) або выклікаецца мясц. награваннем паветра сонечнай радыяцыяй. Найб. характэрна для тэрыторый з кліматам, пераходным ад марскога да кантынентальнага. На Беларусі за снеж.—люты на крайнім ПдЗ бывае больш за 50 дзён з А., на ПнУ — 26—30. Працяглыя А. часам выклікаюць сярод зімы паводкі на рэках.

**АДЛІКО́ВАЕ ПРЫСТАСАВА́ННЕ** вымяральнай прылады, частка прылады, прызначаная для адліку яе паказанняў. А.п. аналогавай прылады складаецца са шкалы і паказальніка (стрэлка, прамень святла), пры гэтым рухомымі могуць быць паказальнік або шкала. А.п. лікавай прылады дае паказанні непасрэдна ў лікавай форме з дапамогай мех., эл. і электрамех. індыкатараў.

**АДЛІ́ЎКА**, выраб, які атрымліваецца пры заліўцы расплаўленага металу, горнай пароды, шлаку, шкла, пластмасы і інш. у ліцейную форму. Можа быць гатовай дэталлю ці загатоўкай, зліткам для апрацоўкі на пракатных станах, паўфабрыкатам для пераплаўкі (чушкавы метал). Металічныя А. вырабляюць з шэрага, коўнага і легіраванага чыгуну (75% па масе), вугляродзістых і легіраваных сталяў (20%) і каляровых сплаваў.

**АДЛО́Ў**, 1) здабыча жывымі пэўнай колькасці дзікіх жывёл для навук. даследаванняў, заапаркаў і заасадоў, утрымання ці развядзення ў няволі, рассялення за межамі дадзенага рэгіёна (у мэтах *акліматызацыі* ці *рэакліматызацыі*). 2) Здабыча жывёл (пераважна млекакормячых і птушак) у прамысл. мэтах з дапамогай спец. прыстасаванняў і прылад: цянётаў, гонаў і інш. сетак, самалоўных пастак, садкоў, лоўчых ям і інш. Для многіх відаў жывёл А. рэгулюецца нормамі міжнар. і нац. заканадаўстваў, магчымы толькі ў межах вылучаных *квот* або на падставе выдадзеных прыродаахоўнымі органамі *ліцэнзій*; адступленне ад іх лічыцца *браканьерствам*.

**АДЛУЧЭ́ННЕ** ад царквы, выключэнне з рэлігійнай абшчыны асоб за тое, што адмаўляюць Бога, не шануюць Маці Божую, святыя абразы. Выкарыстоўваецца як мера царк. пакарання ў праваслаўі, каталіцызме, іудаізме і некаторых інш. рэлігіях. Кананічнае права адрознівала вялікае А., урачыстае (*анафема*) і малое (часовае, якое «вылечвае»). У сучасных умовах назіраюцца тэндэнцыі да адмаўлення ад такога пакарання.

**АДЛЮСТРАВА́ННЕ**, уласцівасць матэрыі, якая заключаецца ў перадачы асаблівасцяў аб'екта або працэсу, якія адлюстроўваюцца. Выяўляецца ў здольнасці любой рэчы ў неарган. прыродзе ўзнаўляць такія змены, адбіткі, рэакцыі, якія знаходзяцца ў адпаведнасці (або падабенстве) з рэччу, якая на яе ўздзейнічае. Жывыя арганізмы выкарыстоўваюць уласцівасць А. як сродак самазахавання і самапрыстасавання да навакольнага асяроддзя, пачынаючы ад раздражняльнасці раслін і прасцейшых арганізмаў. У ходзе эвалюцыі раздражняльнасць як агульная ўласцівасць арганізма прасцейшых ператвараецца ў элементарную *адчувальнасць* нервовай тканкі, а потым — у непасрэдную псіхічную дзейнасць жывёл у працэсе развіцця органаў пачуццяў і галаўнога мозга. У выніку працяглага працэсу антра-






Светлавое адліковае прыстасаванне: 1 — крыніца святла; 2 — аптычнае прыстасаванне з ніткай або кап'ём (3); 4 — люстэрка, замацаванае на рухомай частцы вымяральнага механізма; 5 — шкала з спраектаваным на яе відарысам ніткі.

патэнезу ўзнікаюць і развіваюцца свядомае псіхічнае А. і дзейнасць людзей. Вышэйшая, спецыфічная чалавечая форма А. — *свядомасць*.

*Літ.:* Тюхтин В.С. Отражение. Системы. Кибернетика. М., 1972; Петушкова Е.В. Отражение в живой природе: Динамика теорет. моделей. Мн., 1983; Губанов Н.И. Чувственное отражение. М., 1986. *Я.В.Петушкова.*

**АДЛЮСТРАВА́ННЕ** ў матэматыцы, закон, паводле якога кожнаму элементу x мноства X адпавядае пэўны элемент y = f(x) мноства Y (пры гэтым X можа супадаць з Y). А. наз. ін'ектыўным, калі з таго, што элементы a і b мноства X розныя, вынікае, што f(a) і f(b) — розныя элементы мноства Y; сюр'ектыўным, калі кожны элемент мноства Y — вобраз якога-н. элемента мноства X; біекцыяй або біектыўным — калі А. адначасова ін'ектыўнае і сюр'ектыўнае і г.д. Гл. таксама *Функцыя, Аператар, Пераўтварэнне.*

**АДЛЮСТРАВА́ННЕ МАСТА́ЦКАЕ**, спецыфічная форма асваення рэчаіснасці. Метадалагічнай асновай разумення сутнасці А.м. з'яўляецца *адлюстравання тэорыя*, якая раскрывае агульныя заканамернасці і спосабы адэкватнага спасціжэння свету. Ужо ў антычнасці піфагарэйцы, а потым Платон і Арыстоцель сцвярджалі ідэю аб мімесісе (перайманні) як асн. эстэт. прынцыпе і сутнасці мастацтва. Наследаванне прыродзе было дамінантай у эст. трактоўках эпохі Адраджэння, класічнай эстэтыцы 16—17 ст. Гётэ выступаў супраць змешвання прыроды і мастацтва, недаацэнкі суб'ектыўнай творчасці «сапраўднага мастака». М.Г.Чарнышэўскі замацаваў у тэорыі мастацтва паняцце «ўзнаўленне». Сцвярджэнне ў мастацтве прынцыпу канкрэтна-гіст. ўзнаўлення абумоўлівае рэалістычнае адлюстраванне рэчаіснасці (гл. *Рэалізм*). Канцэпцыя актыўнага ўздзеяння мастацтва на духоўны свет чалавека праяўлялася ў адраджэнні ант. тэорыі мімесісу (М.К.Сарбеўскі), развівалася Ф.Скарынам, М.Гусоўскім, Сімяонам Полацкім і інш. У эпоху Асветніцтва элементы А.м. выявіліся ў арыентацыі на пазнавальныя і выхаваўчыя функцыі мастацтва (А.Доўгірд, Л.Бароўскі). К.Каліноўскі, Я.Купала, Я.Колас, М.Багдановіч, Цётка, А. і І. Луцкевічы, А.Гарун і інш. развівалі ўяўленне пра маст. праўду як адлюстраванне праўды жыцця, гісторыі і самабытнай культуры бел. народа. А.м. прадугледжвае асабістыя адносіны творцы да аб'ектаў, што пазнаюцца. Сэнс маст. абагульнення заключаны ў адборы істотнага і заканамернага, у раскрыцці тыповых характараў і сітуацый.

*Літ.:* Дорошевич Э., Конон В. Очерк истории эстетической мысли Белоруссии. М., 1972; Крюковский Н.И. Логика красоты. Мн., 1965; Юлдашев Л.Г. Искусство: философские проблемы исследования. М., 1981; Конан У. Ля вытокаў самапазнання: Станаўленне духоўных каштоўнасцей у святле фальклору. Мн., 1989.

**АДЛЮСТРАВА́ННЯ ТЭО́РЫЯ**, сукупнасць палажэнняў, катэгорый і прынцыпаў, якія выражаюць агульныя заканамернасці эвалюцыйнага развіцця ўсіх формаў *адлюстравання* ў неарганічнай і жывой прыродзе, у сац. рэальнасці. Зыходны прынцып А.т.: вынікі пазнання павінны быць адносна адэкватныя сваёй крыніцы — арыгіналу. У якасці гнасеалагічнага прынцыпу адлюстраванне прызнавалася і ў стыхійным матэрыялізме, але разглядалася як пасіўнае, мёртвае «фатаграфаванне» навакольнага свету. Дыялектыка разглядае яго як складаны і супярэчлівы працэс узаемадзеяння пачуццёвага і рацыянальнага пазнання, мысліцельнай і практычнай дзейнасці. Пры гэтым свядомасць у сваім развіцці не вычэрпваецца паняццем адлюстравання, паколькі ўключае ў сябе творчасць і прадбачанне.

У распрацоўцы А.т. вылучаюць 2 канцэпцыі: функцыянальную і атрыбутыўную. Прыхільнікі першай канцэпцыі сцвярджаюць, што ў неарганічных аб'ектах ёсць толькі перадумовы ўласцівасці адлюстравання, але не яго актыўнае праяўленне. Прыхільнікі другой настойваюць на ўсеагульнасці ўласцівасцяў адлюстравання. Збліжэнню гэтых канцэпцый садзейнічае ўсведамленне суадносін катэгорыі адлюстравання з агульнанавук. паняццем *інфармацыі*, далейшай распрацоўкай прынцыпу глабальнага эвалюцыянізму ў навуцы і *сінергетыцы.*

Катэгорыі і прынцыпы А.т. ўвайшлі ў філас. абгрунтаванне тэорыі функцыянальных сістэм, канцэпцыі сістэмагенезу ў біялогіі, распрацаванай П.К.Анохіным. Асн. прынцыпы А.т. проціпаставіліся прынцыпу тоеснасці мыслення і быцця, які з'яўляецца зыходным для філас. сістэм аб'ектыўнага ідэалізму, а ў шэрагу філас. вучэнняў (напр., у Спінозы, Спенсера) трактуецца ў духу паралелізму паміж зместам свету і зместам яго пазнання (гл. таксама *Пазнанне*).

*Літ.:* Коршунов А.М. Теория отражения и современная наука. М., 1968; Тюхтин В.С. Отражение. Системы. Кибернетика. М., 1972; Петушкова К.П. Отражение в живой природе: Динамика теорет. моделей. Мн., 1988. *В.Я.Петушкова.*

**АДМАЎЛЕ́ННЕ**, элемент дыялектыкі, што фіксуе адзін з неабходных момантаў развіцця і ўмову змены аб'екта, пры якой некаторыя элементы не проста знішчаюцца, але захоўваюцца ў новай якасці. Віды А. розныя. Пры зняцці адбываецца ліквідаванне прадмета як пэўнага цэлага, але з захаваннем яго асобных («станоўчых») элементаў. Дэструкцыя азначае разбурэнне, знішчэнне структуры, якую адмаўляюць. А. ў выглядзе трансфармацыі мае месца ў выпадках пераходу ад адной стадыі развіцця да другой у рамках той жа самай сістэмы. А. сацыяльнае — сукупнасць дзеянняў чалавека па змене наяўных грамадскіх адносін, пры якіх выяўляюцца канкрэтныя суб'екты, аб'екты, мэты, прастора, час, каштоўнасныя арыентацыі і экзістэнцыялы, сродкі, метады. У найб. рэзкіх формах сац. А. выяўляецца ў войнах, рэвалюцыях, генацыдзе, злачыннасці, міжнац. канфліктах і інш. А., якое вядзе да сац. прагрэсу, называюць дыялектычным, процілеглае — чыста суб'ектыўным (гл. *Нігілізм*).

А. ў логіцы — мысленнае процістаўленне аднаго суджэння другому. *Ю.А.Харын.*

**АДМАЎЛЕ́ННЕ АДМАЎЛЕ́ННЯ**, адзін з асн. законаў дыялектыкі, які характарызуе агульную структуру развіцця як неабходнасць паступальнага працэсу з момантамі адноснай паўтаральнасці і цыклічнасці (зняцце, паўторнае адмаўленне, узаемапераход процілегласцяў, вяртанне да нібыта старога і інш.). Упершыню сфармуляваны Гегелем. Паводле яго вучэння, цыклічнасць развіцця мае форму руху ад зыходнага стану аб'екта праз яго адмаўленне да ліквідавання самога гэтага адмаўлення. Так, катэгорыя якасці (непасрэдная, унутраная пэўнасць рэчы) адмаўляецца колькасцю (апасродкаваная, знешняя пэўнасць), а колькасць «здымаецца» ў катэгорыі меры (якаснай колькасці, ці колькаснай якасці). Гегель надаваў *трыядзе* (зыходны момант — адмаўленне — адмаўленне адмаўлення) асаблівае значэнне як спосабу руху лагічных паняццяў. Разам з тым ён трактаваў яе толькі як знешні бок *пазнання*. Таму няма ніякіх падстаў атаясамліваць дыялектычнае паняцце развіцця ўвогуле з трыядамі. Пошукі трыяды як існуючых асобных ступеняў адзінага працэсу ў многіх выпадках вядуць да грубай схематызацыі рэальнай рэчаіснасці. У тым ці іншым сваім выглядзе адмаўленне ранейшых формаў існавання — неабходная ўмова развіцця ў любой сферы рэчаіснасці. Разам з тым у самім характары адмаўлення ёсць аб'ектыўная магчымасць момантаў паўторнасці і вяртання да нібыта старога, нелінейнасці працэсу развіцця. Аднаўленне ў вышэйшай стадыі некаторых рысаў ніжэйшай абумоўліваецца ўзаемапераходам процілегласцяў адна ў адну, зніжэннем узроўню арганізацыі сістэмы пры яе дэструкцыі, захаваннем пераемнасці адмаўляючага і адмаўляемага ў актах зняцця і трансфармацыі. А.а. закон у інтэграцыі сваіх рысаў выяўляецца ў спецыфічных працэсах прыроды і чалавечай гісторыі і з асаблівай нагляднасцю — у сучасных сац. падзеях.

*Ю.А.Харын.*

**АДМІНІСТРАЦЫ́ЙНАЕ ПРА́ВА**, 1) галіна права, якая рэгулюе грамадскія адносіны ў сферы дзярж. кіравання. Нормы А.п. вызначаюць парадак арганізацыі і дзейнасці кіраўнічага апарата, правы і абавязкі службовых асоб і грамадзян. Сістэма А.п. Рэспублікі Беларусь складаецца з агульнай і асаблівай частак. Агульная ўключае нормы, якія маюць рэгуляцыйнае значэнне для ўсіх галін і сфераў дзярж. кіравання: сістэма і крыніцы, суб'екты А.п.,

прынцыпы дзярж. кіравання, сістэма яго органаў, формы і метады кіраўнічай дзейнасці і інш. Нормы асаблівай часткі рэгулююць адносіны ў асобных сферах кіравання: планаванні, уліку, фінансаванні і матэрыяльна-тэхн. забеспячэнні, прам-сці, сельскай гаспадаркі, транспарце, капітальным будаўніцтве, нар. адукацыі, навуцы, культуры, ахове здароўя, сац. абароне, пытаннях адм.-паліт. кіравання (абарона, дзярж. бяспека, грамадскі парадак, юстыцыя) і інш. Гал. крыніцы А.п.: *Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь*, указы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, пастановы Прэзідыума Вярх. Савета і Кабінета Міністраў, *Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях, Мытны кодэкс Рэспублікі Беларусь* і інш., загады, пастановы і інструкцыі нарматыўнага зместу (выдаюцца мін-вамі, дзярж. к-тамі і ведамствамі Рэспублікі Беларусь). Выкананне выкладзеных у гэтых актах правілаў з'яўляецца абавязковым і забяспечваецца выхаваўчымі, арганізацыйнымі і прымусовымі мерамі. У ходзе рэалізацыі нормаў А.п. ўзнікаюць адм. праваадносіны, суб'ектам якіх, з аднаго боку, з'яўляюцца дзярж. орган або службовая асоба, з другога — дзярж. органы, іх службовыя асобы, асобныя грамадзяне, грамадскія арг-цыі і інш. Аб'ектам адм.-прававых адносін у большасці выпадкаў з'яўляецца дзейнасць людзей, іх паводзіны, а таксама пэўная маёмасць. 2) Навука, якая вывучае прававое рэгуляванне дзярж. кіравання, развіццё тэарэт. поглядаў на сутнасць, змест і сістэму прававых нормаў і прававых ін-таў. Навука актыўна садзейнічае ўдасканаленню сістэмы і ўнутр. структуры, удакладненню правоў і абавязкаў органаў дзярж. кіравання і асобных грамадзян. Праблемы А.п. на Беларусі вывучаюць А.М.Абрамовіч, В.І.Семянкоў, В.І.Шабайлаў і інш.

**АДМІНІСТРАЦЫ́ЙНАЕ ПРАВАПАРУШЭ́ННЕ**, правіннасць, проціпраўнае наўмыснае або неасцярожнае дзеянне (або бяздзеянне), замах на дзярж. або грамадскі парадак, уласнасць, правы і свабоды грамадзян і інш. Паводле заканадаўства Рэспублікі Беларусь да А.п. адносяцца: парушэнні грамадскага парадку, правілаў дарожнага руху, проціпажарных, сан.-эпідэміялагічных, мытных правілаў, пагранічнага рэжыму, парушэнні правілаў палявання, рыбнай лоўлі і аховы рыбных запасаў і інш. За А.п. прадугледжана адм. адказнасць (калі правапарушэнні не цягнуць за сабой крымін. адказнасці).

**АДМІНІСТРАЦЫ́ЙНА - КАМА́НДНАЯ СІСТЭ́МА**, антыдэмакратычная іерархічна арганізаваная сістэма кіравання грамадствам, заснаваная на прынцыпах бюракратычнага цэнтралізму і адміністравання. Найчасцей пашырана ў краінах, дзе пануе практыка паліт. ўладарання, што характарызуецца рэжымам асабістай дыктатуры (гл. *Аўтарытарызм*) або непадзельным кантролем адной паліт. партыі, групы, ідэалогіі за ўсімі сферамі жыцця грамадства і асобы (гл. *Таталітарызм*). Такі манапалізм найперш характэрны для сац.-эканам. сістэмы сацыялізму, якая не змагла забяспечыць свабоднае нац.-дзярж. і культ. развіццё народаў, больш высокую прадукцыйнасць працы і ўзровень жыцця людзей у параўнанні з краінамі «процілеглай» сістэмы. У Сав. Расіі, б. СССР, у т.л. на Беларусі, асн. рысы такой сістэмы пачалі складвацца ў перыяд *«ваеннага камунізму»* і развіліся ў 1920—30-я г. з усталяваннем сталінскага таталітарнага рэжыму. Гэта праяўлялася ва ўсеагульнай цэнтралізацыі кіравання, выкарыстанні адм.-камандных метадаў, зрошчванні парт. і дзярж. апарату, правядзенні масавых рэпрэсій і фактычнай ліквідацыі інстытутаў дэмакратыі. У эканоміцы базай А.-к.с. з'яўляецца манаполія дзярж. формы ўласнасці на сродкі вытворчасці і вынікі працы. Асн. сродкі эканам. рэгулявання ў рамках А.-к.с. — дырэктыўнае планаванне, цэнтралізаванае размеркаванне ўсіх відаў рэсурсаў і прадукцыі, выкарыстанне пазаэканам. формаў прымусу, іерархічная вертыкальная структура кіравання, ураўняльныя тэндэнцыі пры размеркаванні вынікаў працы ў спалучэнні з шырокай сістэмай прывілеяў для бюракратычнага апарату. Абавязковыя элементы парт.-дзярж. рэгулявання сац. працэсаў — ліквідацыя рэшткаў рыначных адносін і свабоднага прадпрымальніцтва, прымусовая *калектывізацыя* і раскулачванне сялянства, прымусовыя падпіскі на дзярж. пазыкі, рэзкае павелічэнне падаткаў і г.д. Сістэма, пабудаваная на насіллі і ігнараванні эканам. законаў, завяла ў тупік эканоміку краіны, стала прычынай крызісных з'яў у розных галінах нар. гаспадаркі і сац.-эканам. краху ў канцы 1980 — пач. 1990-х г. Канцэнтрацыя ўлады ў руках крайне вузкай і малакампетэнтнай групы вышэйшых чыноўнікаў, прымат паліт. волі над эканам. мэтазгоднасцю, сваёмае процідзеянне працэсу нац.-культ. адраджэння спарадзілі адчужэнне грамадзян ад дзяржавы і ўласнасці, падарвалі духоўны і стваральна-творчы патэнцыял бел. грамадства. Пасля распаду СССР і ўтварэння незалежнай дзяржавы на Беларусі ўзніклі аб'ектыўныя перадумовы для ліквідацыі негатыўных вынікаў А.-к.с., усталявання дэмакр. сістэмы кіравання сац. працэсамі, ажыццяўлення суверэннага права народа на самавызначэнне і свабоду выбару ўласнага шляху развіцця.

*Літ.:* Экономическая история: Проблемы и исследования. М., 1987; Правда истории: память и боль. Мн., 1991; Эканамічная гісторыя Беларусі. Мн., 1993. *В.І.Мянькоўскі.*

**АДМІНІСТРАЦЫ́ЙНА - ТЭРЫТАРЫЯ́ЛЬНЫ ПАДЗЕ́Л**, падзел тэрыторыі дзяржавы на часткі — адм.-тэр. адзінкі (губерні, акругі, землі, правінцыі, штаты, вобласці, раёны, дэпартаменты і інш.), на аснове якіх ствараюцца і дзейнічаюць органы дзярж. улады, кіравання і самакіравання. Асн. мэта — стварыць аптымальныя ўмовы для эфектыўнай арганізацыі і дзеяння ўсяго дзярж. механізма. Ажыццяўляецца з улікам прыроднагіст., эканам. і геагр. умоў, нац. асаблівасцяў, сац.-культ., паліт. і інш. фактараў.

У 9 ст. на тэр. Беларусі існавалі племянныя саюзы *крывічоў* (*палачан*), *дрыгавічоў* і *радзімічаў*. У 10—11 ст. склаліся Полацкая і Тураўская землі, якія захоўвалі пэўную самастойнасць пад уладай кіеўскіх князёў. Да сярэдзіны 12 ст. яны адасобіліся ў паўсамаст. дзярж. ўтварэнні — *княствы*. З Полацкай зямлі вылучыліся Віцебскае, Друцкае, Ізяслаўскае, Лагожскае, Менскае і, магчыма, інш. ўдзельныя княствы; з Тураўскай — Пінскае і, верагодна, Клецкае і Слуцкае. Усх. ч. Беларусі з Мсціславам уваходзіла ў Смаленскае княства, паўд.-зах. з Берасцем і Кобрынам — у Галіцка-Валынскае, паўд.-ўсх. з Гомелем і Рэчыцай — у Чарнігаўскае. У Панямонні існавалі Ваўкавыскае, Гарадзенскае, Новагародскае і Слонімскае княствы, якія разам з племяннымі княствамі Літвы ў сярэдзіне 13 ст. ўтварылі ядро *Вялікага княства Літоўскага*. Да сярэдзіны 14 ст. ў ВКЛ увайшла ўся Беларусь, якая ў яго складзе падзялялася на судова-адм. акругі (землі, княствы, *намесніцтвы*), чые межы гістарычна склаліся ў мінулым. Полацкая і Віцебская землі з пач. 16 ст. называліся *ваяводствамі*. Каля 20 бел. княстваў і намесніцтваў (паветаў) уваходзілі ў Віленскае і Троекае ваяв., утвораныя ў 1413; Мазырскі пав. да 1569 — у Кіеўскае ваяв. У выніку адм. рэформы 1565—66 тэр. ВКЛ была падзелена на 30 *паветаў*, з якіх 16 цалкам ці часткова знаходзіліся на Беларусі і ўваходзілі ў Берасцейскае, Віленскае, Віцебскае, Менскае, Мсціслаўскае, Новагародскае, Полацкае і Троекае ваяв. У 1618—54 да Беларусі адносілася Смаленскае ваяв. са Старадубскім пав. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) на далучаных да Рас. імперыі бел. землях утвораны Полацкае і Магілёўскае намесніцтвы (у 1796 аб'яднаны ў Беларускую губ.), пасля 2-га падзелу (1793) — Мінская губ., пасля 3-га падзелу (1795) — Слонімская і Віленская губ. (у 1797 аб'яднаны ў Літоўскую губ.). У 1802—1917 на Беларусі існавалі 5 губерняў: Віленская, Віцебская, Гродзенская, Магілёўская, Мінская. Яны падзяляліся на паветы, колькасць якіх мянялася; з 1861 паветы падзяляліся на воласці. У 1917 не занятыя герм. войскамі бел. губерні і паветы аб'яднаны ў *Заходнюю вобласць* з цэнтрам у Мінску. У сак. 1918 у сувязі з прасоўваннем герм. войск да яе далучана Смаленская губ., цэнтр перанесены ў Смаленск.

25.3.1918 абвешчана *Беларуская Народная Рэспубліка* (БНР), у склад якой павінны былі ўвайсці б. Гродзенская, Магілёўская, Мінская губ. і паветы Віленскай, Віцебскай, Смаленскай, Чарнігаўскай губ., населеныя пераважна беларусамі. Фактычна Рада БНР дзейнічала толькі на тэр. Беларусі, занятай герм. войскамі, за выключэннем паўд. часткі, часова ўключанай у склад Украіны. 1.1.1919 у Смаленску абвешчана *Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка* ў межах, якія амаль супадалі з пракламаванымі межамі БНР. Аднак ва ўмовах польскага насту-

# АДМІНІСТРАЦЫЙНА-ТЭРЫТАРЫЯЛЬНЫ ПАДЗЕЛ БЕЛАРУСІ І СУМЕЖНЫХ ТЭРЫТОРЫЙ у сярэдзіне XVIII ст.


22° на ўсход ад Грынвіча
24°
26°
28°
30°
32°
56°
54°
52°
РАСІЙСКАЯ ІМПЕРЫЯ
КУРЛЯНДСКАЕ ГЕРЦАГСТВА
ІНФЛЯНЦКАЕ ВАЯВОДСТВА
ПОЛАЦКАЕ ВАЯВОДСТВА
ВІЛЕНСКАЕ ВАЯВОДСТВА
ТРОКСКАЕ ВАЯВОДСТВА
НАВАГРАДСКАЕ ВАЯВОДСТВА
ВІЦЕБСКАЕ ВАЯВОДСТВА
МСЦІСЛАЎСКАЕ ВАЯВОДСТВА
ЧАРНІГАЎСКАЕ ВАЯВОДСТВА
ЛІТОЎСКАЕ ВАЯВОДСТВА
ПІНСКАЕ ВАЯВОДСТВА
ПОЛЬСКАЕ КАРАЛЕЎСТВА
ЖМУДЗЬ
(ЖАМОЙДЗЬ)
ВЯЛІКАЯ ЛІТОЎСКАЯ ГАСПАДАРСТВА
ВЯЛІКАЯ ЛІТОЎСКАЯ КНЯСТВА
ДЫНАБУРГ
ВІЛЬНЯ
ТРОКІ
КОЎНА
ГРОДНА
МІНСК
НОВАГАРОДАК
ПАЛЕССЕ
БЕРАСЦЕ
ПІНСК
ПОЛАЦАК
ВІЦЕБСК
СМАЛЕНСК
МСЦІСЛАЎ
ОРША
МАГІЛЁЎ
МАЗЫР
ЧАРНІГАЎ
СЛУЦК
НЕСВІЖ
НЯСВІЖ
КОБРЫН
ЛУЦК
ЛЮБАРТАЎ
ЛЮБЕШАЎ
ЛЮБЕЧ
ГОМЕЛЬ
РЭЧЫЦА
ЖЫТКАВІЧЫ
ТУРАЎ
ПЕТРЫКАЎ
ЛЕЛЬЧЫЦЫ
ЛОЕЎ
ГРАБАВА
ХОЙНІКІ
БРАГІН
СЛАВЯТЫЧЫ
ЧЭРЫКАЎ
ЧАЧЭРСК
ГАРАДОН
ЦЕСТА
ЛОСВІДА
ЛЕВЯНА
ЛЮБАВІЧЫ
ДУБРОЎНА
ГОРКІ
ЖУКАВА
ХІСЛАВІЧЫ
ЧАЎСЫ
КРЫЧАЎ
ЧЭРЫКАЎ
ХОЦІМСК
ПРАПОЙСК
МАНРАЕ
КАРМА
ПАЛЕВА ГАРА
ЧЭЧЭРСК
ГОРВАЛЬ
ДАБРУШ
ЮРЫЧАВІЧЫ
ДАНІЛАВІЧЫ
ЮЛЬ
ХАЛЬЧА
ЛЯЎЧЫ
ГРАБАВА
ЛЮБЕЧ
ЧАРНІГАЎ
Мітава
Рыга
Ліпава
Гольдынга
Ворні
Шаўлі
Біржы
Расіены
Вялена
Жэймы
Сапежышкі
Ражыт
Кейданы
Шталупянен
Гумбінен
Вайкавышкі
Сувалкі
Гольдап
Аўгустаў
Сейны
Вяцесі
Мерач
Гродна
Беласток
Бельск
Ваўкавыск
Слонім
Нясвіж
Слуцк
Капыль
Клецк
Старобін
Любань
Пагост
Урэчча
Семежава
Дарогі
Вельча
Глуск
Парычы
Стрэшын
Кашалёва
Рагачоў
Бабруйск
Капыль
Мінск
Барысаў
Крупкі
Талачын
Круглае
Галоўчын
Шклоў
Копысь
Орша
Дубровна
Чашнікі
Лукомль
Чарэя
Домжарычы
Бешанковічы
Астроўна
Бачэйкавічы
Лепель
Сянно
Бабіна
Ушачы
Забор'е
Суша
Обаль
Туроўля
Варонеч
Полацк
Друя
Друйск
Браслаў
Друсяты
Іказнь
Відзы
Пагост
Друсяты
Дуклята
Дуклянцы
Дуклянцы
Дуклянцы

# АДМІНІСТРАЦЫЙНА-ТЭРЫТАРЫЯЛЬНЫ ПАДЗЕЛ БЕЛАРУСІ І СУМЕЖНЫХ ТЭРЫТОРЫЙ у 2-й палове XIX—пачатку XX ст.




Спецыяльны змест распрацаваны Л.Р.Казловым

НАСЕЛЕНЫЯ ПУНКТЫ
па колькасці жыхароў
больш за 100 000 жыхароў
ад 50 000 да 100 000 жыхароў
ад 10 000 да 50 000 жыхароў
менш за 10 000 жыхароў
па тыпу паселішча
ЛІДА Гарады абласнога падпарадкавання
ДЗІСНА Гарады раённага падпарадкавання
Копысь Пасёлкі гарадскога тыпу
Глуша Рабочыя пасёлкі
Мігры Сельскія населеныя пункты
па адміністрацыйным значэнні
МІНСК Сталіца БССР
МАЗЫР Цэнтры абласцей
Цэнтры раёнаў
ГРАНІЦЫ
дзяржаўныя
саюзных рэспублік
абласцей
раёнаў
Чыгункі
Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Беларускай ССР дадзены на 1. 1. 1941 г.
Граніцы СССР дадзены на 22 чэрвеня 1941 г.
Граніцы замежных дзяржаў—на 1 сакавіка 1938 г
ЛАТВІЙСКАЯ ССР
КАЛІНІНСКАЯ ВОБЛ.
СМАЛЕНСКАЯ ВОБЛ.
ГЕРМАНІЯ
ЛІТОЎСКАЯ ССР
ПОЛЬШЧА
ВАЛЫНСКАЯ ВОБЛ.
РОВЕНСКАЯ ВОБЛ.
ЖЫТОМІРСКАЯ ВОБЛ.
КІЕЎСКАЯ ВОБЛ.
ЧАРНІГАЎСКАЯ ВОБЛ.
ОРЛОЎСКАЯ ВОБЛ.
ДАЎГАЎПІЛС (ДЗВІНСК)
НЕВЕЛЬ
БЕЛЬЦО
ВІЦЕБСК
ПОЛАЦК
МАГІЛЁЎ
МІНСК
ГОМЕЛЬ
БРЭСТ
ГРОДНА
ЛІДА
БАРАНАВІЧЫ
БАБРУЙСК
СЛУЦК
ПІНСК
МАЗЫР
СМАЛЕНСК
ЧАРНІГАЎ

# РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ. ПАЛІТЫКА-АДМІНІСТРАЦЫЙНАЯ КАРТА

пленне ў лют. 1919 Віцебская, Магілёўская і Смаленская губ. ўключаны ў склад РСФСР (пры гэтым Магілёўская губ. пераўтворана ў Гомельскую), незанятая палякамі астатняя частка БССР — у склад Літ.-Бел. Сав. Сацыялістычнай Рэспублікі, якая пасля ўступлення польскіх войскаў у Мінск у жн. 1919 фактычна спыніла існаванне. У выніку контрнаступлення Чырв. Арміі 31.7.1920 БССР была адноўлена пад назвай Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка Беларусь, але без усх. ч., якая засталася ў складзе РСФСР. Паводле *Рыжскага мірнага дагавору 1921* да Польшчы адышла і зах. ч. Беларусі (гл. *Заходняя Беларусь*). У складзе БССР засталіся толькі Бабруйскі, Барысаўскі, Ігуменскі, Мазырскі, Мінскі і Слуцкі пав. б. Мінскай губ. У такіх межах 30.12.1922 БССР увайшла ў склад СССР. У сак. 1924 да БССР далучаны ч. Віцебскай, Гомельскай і Смаленскай губ. (1-е ўзбуйненне). 17.7.1924 у БССР уведзены новы А.-т.п. на 10 *акруг*, 100 *раёнаў*, 1202 *сельсаветы*. У час 2-га ўзбуйнення (снеж. 1924) да БССР далучаны Рэчыцкая і Гомельская акругі (б. паветы) з 18 раёнамі, пасля ўзгадненняў у 1927 усх. граніца набыла сучасны выгляд. Планаванае на пач. 1930-х г. 3-е ўзбуйненне не адбылося. Да 1930 акругі ў БССР скасаваны, захаваўся падзел на 90 раёнаў. У 1935 адноўлены 4 акругі на граніцы з Польшчай (Лепельская, Мазырская, Полацкая і Слуцкая). У студз.—лют. 1938 утвораны 5 *абласцей*: Віцебская, Гомельская, Магілёўская, Мінская, Палеская. У вер. 1939 да БССР далучана Зах. Беларусь, якая з 1921 у складзе Польшчы падзялялася на Беластоцкае, Віленскае, Навагрудскае і Палескае ваяв. з 26 паветамі, што падзяляліся на гміны. На тэр. б. Зах. Беларусі ўтворана 5 абласцей: Баранавіцкая, Беластоцкая, Брэсцкая, Вілейская і Пінская (101 раён); *Віленскі край* у кастр. 1939 перададзены Літве. Ёй жа ў ліст. 1940 перададзена тэр. Гайдуцішскага, Парэцкага і Свянцянскага р-наў. У час ням.-фаш. акупацыі 1941—44 зах. ч. Беларусі (акруга Беласток) далучана да Усх. Прусіі, паўд. раёны — да рэйхскамісарыята «Украіна»; усх. ч. ўваходзіла ў зону армейскага тылу. Астатнія тэр. Беларусі (каля 1/3) утварылі *генеральную акругу Беларусь* у складзе рэйхскамісарыята «Остланд». Пасля вызвалення Беларусі ў вер. 1944 20 яе раёнаў і г. Беласток перададзены Польшчы, Беластоцкая вобл. скасавана, Вілейская вобл. перайменавана ў Маладзечанскую, утвораны Бабруйская, Гродзенская і Полацкая вобл. У студз. 1954 скасаваны Бабруйская, Баранавіцкая, Палеская, Пінская і Полацкая вобл., у студз. 1960 — Маладзечанская вобл. Колькасць раёнаў неаднаразова мянялася, з 1966 іх было 117; 28.12.1989 адноўлены Дрыбінскі р-н. На 1.10.1994 у *Рэспубліцы Беларусь* 1088 адм.-тэр. адзінак, у т.л. 6 абласцей (Брэсцкая, Віцебская, Гомельская, Гродзенская, Магілёўская, Мінская) і сталічны горад Мінск, 118 сельскіх і 25 гар. раёнаў, 101 горад абласнога і раённага падпарадкавання, 109 пасёлкаў гар. тыпу, 1448 сельскіх Саветаў. А.-т.п. рэспублікі замацаваны Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь. Парадак вырашэння пытанняў адм.-тэр. ўладкавання дзяржавы адносіцца да выключнай кампетэнцыі ВС Рэспублікі Беларусь.

*Літ.:* Круталевич В.А. Административно-территориальное устройство БССР. Мн., 1966; Административно-территориальное устройство БССР: Справ. Т. 1—2. Мн., 1985—87; Казлоў Л., Цітоў А. Беларусь на сямі рубяжах. Мн., 1993.

*В.А.Кадаўбовіч, В.Л.Насевіч* (гісторыя).

**АДМІНІСТРАЦЫ́ЙНАЯ АДКА́ЗНАСЦЬ**, гл. ў арт. *Адказнасць юрыдычная*.

**АДМІНІСТРАЦЫ́ЙНАЯ ЮРЫСДЫ́КЦЫЯ**, дзейнасць органаў дзярж. кіравання і іх службовых асоб па вырашэнні індывідуальных адм. спраў і прымяненні адпаведных юрыд. санкцый у адм. парадку. У некаторых краінах А.ю. ажыццяўляюць спец. органы т.зв. адм. юстыцыі (напр., адм. ведамасныя суды ў ЗША, Вялікабрытаніі, адм. трыбуналы акруг у Францыі і ў інш.). У б. СССР не было адасобленай сістэмы спец. органаў адм. юстыцыі. У Рэспубліцы Беларусь да органаў, што ажыццяўляюць А.ю., адносяцца адміністрацыйныя камісіі пры выканкомах мясц. Саветаў дэпутатаў, выканкомы пасялковых і сельскіх Саветаў, раённыя камісіі па справах непаўналетніх, раённыя суддзі, службовыя асобы органаў унутр. спраў, дзярж. інспекцыі і інш. Парадак вядзення спраў органамі, якія ажыццяўляюць А.ю., рэгламентаваны заканадаўствам Рэспублікі Беларусь. Гл. таксама *Адміністрацыйнае правапарушэнне*.

**АДМІНІСТРАЦЫ́ЙНЫ КО́ДЭКС**, гл. ў арт. *Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях*.

**АДМІНІСТРАЦЫ́ЙНЫ НАГЛЯ́Д**, 1) дзейнасць органаў дзярж. кіравання па кантролі за выкананнем арг-цыямі, службовымі асобамі і грамадзянамі ўстаноўленых дзяржавай правілаў у асобных галінах кіравання. 2) Нагляд за асобамі, вызваленымі з месцаў пазбаўлення волі. Існаваў з 1966 на тэр. СССР і ажыццяўляўся органамі МУС за некаторымі катэгорыямі злачынцаў (напр., за асабліва небяспечнымі рэцыдывістамі). Наладжваўся (тэрмін ад 6 месяцаў да 1 года) па месцы жыхарства вызваленых і меў на мэце папярэдзіць учыненне новых злачынстваў. А.н. устанаўліваў пэўныя абмежаванні для паднагляднага, парушэнне якіх праследавалася ў адм. ці крымін. парадку. У Рэспубліцы Беларусь адменены ў крас. 1992. У дарэвалюцыйнай Расіі дзейнічаў аналагічны гэтай адм. меры паліцэйскі нагляд, які ажыццяўляўся галосна і тайна, часова і пажыццёва. Выкарыстоўваўся не толькі як мера папярэджання крымін. злачыннасці, але і як сродак барацьбы з вызв. рухам з пач. 19 ст. Заканадаўча зацверджаны ў 1882. Паднаглядны не меў права мяняць месца жыхарства, знаходзіцца на дзярж. і грамадзянскай службе, займацца пед. дзейнасцю і г.д. А.н. існуе ў многіх сучасных замежных краінах.

**АДМІНІСТРА́ЦЫЯ** (ад лац. administratio кіраўніцтва), 1) сукупнасць органаў выканаўчай улады, што ажыццяўляе мерапрыемствы па кіраванні краінай, рэгіёнам, горадам, прадпрыемствам і г.д. (раённая А., абл. А., А. Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, *Кабінет Міністраў Рэспублікі Беларусь*). 2) Службовыя асобы, кіраўнікі, персанал установы, прадпрыемства ці яго структурнай часткі (А. завода, А. цэха).

**АДМІНІСТРА́ЦЫЯ ДАПАМО́ГІ І АДНАЎЛЕ́ННЯ АБ'ЯДНА́НЫХ НА́ЦЫЙ** (United Nations Relief and Rehabilitation Administration, ЮНРРА), міжнародная арганізацыя ў 1943—47. Створана ў Вашынгтоне 44 дзяржавамі — удзельніцамі антыгітлераўскай кааліцыі з мэтай аказання дапамогі насельніцтву краін, якія вызваліліся ад ням.-фаш. і яп. акупацыі. Беларусь далучылася да ЮНРРА у жн. 1945. Дапамога ажыццяўлялася прадуктамі, медыкаментамі і інш. рэчамі ў памеры каля 2% ад нац. даходу краін-удзельніц, якія не былі акупіраваны. Іх агульны ўзнос у 1943—47 склаў 3728 млн. долараў.

**АДМІНІ́СТРАЦЫЯ ПРЭЗІДЭ́НТА РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ**, рабочы орган, які ствараецца пры Прэзідэнце. У адпаведнасці з палажэннем і штатным раскладам ажыццяўляе інфармацыйную і арганізацыйна-тэхн. дзейнасць. Адміністрацыя не мае права ўмешвацца ў работу Кабінета Міністраў і дубліраваць яго функцыі. Кіраўнік адміністрацыі прызначаецца Прэзідэнтам, іншыя работнікі — па ўзгадненні з Прэзідэнтам. Свае паўнамоцтвы яна складае перад нававыбраным Прэзідэнтам.

**АДМІРА́Л** [гал. admiraal ад араб. амір аль (бахр) уладар на моры], воінскае званне (чын) вышэйшага афіцэрскага саставу ў ваенна-марскіх флатах мн. дзяржаў. У Еўропе паявілася ў 12 ст. ў Венецыі і Генуі, а затым распаўсюдзілася на флаты інш. краін (у Польшчы ўведзена ў 17 ст., у Расіі — на пач. 18 ст. У СССР установлена з 1940 і адпавядала званню генерал-палкоўніка ў арміі). Існуюць таксама званні контрадмірал, віцэ-адмірал, адмірал флоту і інш.

**АДМІРА́Л** (Vanessa atalanta), насякомае атр. матылёў. Пашыраны ў Еўразіі. На Беларусі нешматлікі від, трапляецца на палянах, лугах, берагах ручаёў, уключаны ў Чырвоную кнігу.

Размах крылаў да 6 см. Пярэднія крылы зверху чорныя з белымі плямкамі і чырвонай

косай палоскай (адсюль назва), заднія — чорныя, з чырвонай палоскай на краі. Лёт у ліп.—вер., тых, што перазімавалі, — у маі. Вусені развіваюцца ў чэрв.—жн. на лісці крапівы і чартапалоху.

**АДМІРАЛЦЕ́ЙСТВА**, 1) ранейшая назва тэрыторыі порта з верфямі, стапелямі, майстэрнямі, складамі, пад'язнымі шляхамі і інш. для рамонту і забеспячэння ваенных караблёў. У Расіі ў канцы 17 — пач. 19 ст. дзярж. А. былі ў Варонежы, Санкт-Пецярбургу (Галоўнае А.), Архангельску, Астрахані, Кранштаце, Севастопалі і Нікалаеве. 2) У Вялікабрытаніі вышэйшы орган кіравання ВМС, які адпавядае марскому мін-ву. Існаваў з 1690 як калегія з часовых членаў А. замест былога адзінаўладнага кіравання лорда вярхоўнага адмірала. З

Адмірал і яго вусень.

1869 А. ўзначальвае першы лорд А., ён жа марскі міністр, якому падначалены савет А. з вышэйшых марскіх афіцэраў. 3) Будынак у Санкт-Пецярбургу (кампазіцыйны цэнтр, да якога сыходзяцца тры гал. магістралі горада), выдатны твор архітэктуры рускага ампіру. Закладзены ў 1704 паводле задумы Пятра I як карабельная верф. Пазней перабудоўваўся рас. архітэктарамі І.К.Корабавым у 1727—38 і А.Дз.Захаравым у 1806—23. З 19 ст. тут размяшчаліся цэнтр. ўстановы Марскога мін-ва, пасля 1917 — установы ВМФ.

**АДМІРАЛЦЕ́ЙСТВА АСТРАВЫ́** (Admiralty Islands), група вулканічных і каралавых астравоў на З Ціхага ак., у *Бісмарка архіпелагу*. Уваходзіць у склад Папуа—Новая Гвінея. Пл. 2072 км$^2$. Нас. 33,3 тыс. чал. (1978), папуасы. Выш. да 719 м. Найб. значны в-аў Манус (1,6 тыс. км$^2$). Клімат трапічны, вільготны. Плантацыі какосавых пальмаў. Рыбалоўства. Гал. горад — Ларэнгау. Адкрыты ў 1527—29 ісп. мараплаўцам А.Сааведра.

**А́ДМІРАЛЦІ** (Admiralty), горны хрыбет у паўн.-зах. ч. Зямлі Вікторыі (Усх. Антарктыда). Даўж. больш за 100 км. Зах. адгор'і хрыбта дасягаюць мора Роса. Выш. да 4163 м. Складзены пераважна з дакембрыйскіх пясчанікаў, гліністых сланцаў і вапнякоў, месцамі перарваных інтрузіямі гранітаў. Парэзаны далінамі, запоўненымі ледавікамі. Адкрыты ў 1841 англ. экспедыцыяй Дж. Роса, названы ім у гонар Брыт. адміралцейства.

**АДМІРА́ЛЬСКІ СЦЯГ**, спец. сцяг, уведзены для найвышэйшых службовых асоб флоту. Узняты на мачце карабля, А.с. абазначаў прысутнасць на ім службовай асобы адміральскага звання. Карабель у такім выпадку наз. флагманскім (адміральскім). Сцяг адмірала ўзнімаўся на грот-мачце, віцэ-адмірала — на фок-мачце, контр-адмірала — на бізань-мачце.

Да арт. **Адміралцейства.** Вежа Адміралцейства ў Санкт-Пецярбургу. 1806—23. Архітэктар А.Дз.Захараў.




Вольтамперная характарыстыка элемента з адмоўным супраціўленнем. *AB* — спадальны ўчастак.

**АДМО́ЎЕ** ў граматыцы, граматычная катэгорыя, якая паказвае на адсутнасць прадмета, якасных прыкмет прадмета, дзеяння або стану, а таксама слова-сказ, што перадае нязгоду з выказваннем («не»). У бел. мове асн. сродкі выражэння: часціца «не» («Ён не чытае»); часціца «ні» («На небе ні хмурынкі»); займеннікі і прыслоўі з прэфіксамі «не» («нейкі», «неяк») або «ні» («ніхто», «ніякі»); прэдыкатывы «не», «нельга», «немагчыма»; слова «не» як эквівалент адмоўнага члена сказа або яго галоўнага члена ў рэпліках, пры супрацьпастаўленні («Ён дома? — Не»); слова «няма».

А. можа быць агульнае — калі адмаўляецца ўся сітуацыя, пра якую паведамляецца ў сказе («Брат не хадзіў учора ў кіно»), і прыватнае — калі адмаўляецца толькі частка сітуацыі («Брат хадзіў учора не ў кіно», «не брат хадзіў учора ў кіно»). *Я.М.Камароўскі.*

**АДМО́ЎНАЕ СУПРАЦІЎЛЕ́ННЕ**, уласцівасць некаторых звычайна нелінейных элементаў эл. ланцугоў змяншаць падзенне напружання на іх пры павелічэнні сілы току (напр., 4-слойны некіроўны дыёд, тунэльны дыёд). У ланцугах пераменнага току індуктыўнае супраціўленне можна разглядаць як А.с. ў адносінах да ёмістаснага. У ланцугах пастаяннага току А.с. ўзнікае ў вобласці значэнняў токаў і напружанняў пры наяўнасці на вольт-ампернай характарыстыцы элемента ўчастка, які зніжаецца.

**АДМО́ЎНЫ ЛІК**, рэчаісны лік, меншы за 0, напр., -2; -0,5 і г.д. На лікавай прамой адлюстроўваецца пунктамі злева ад пачатку адліку (ад 0). Гл. таксама *Дадатны лік.*

**АДМУ́ЧВАННЕ**, раздзяленне ўзмучаных цвёрдых дробных часцінак, заснаванае на розных скарасцях іх асядання ў вадзе; спосаб гідраўл. класіфікацыі здробненых матэрыялаў. Уключае адстойванне полідысперснай суспензіі з дэкантацыяй у паслядоўна злучаных *адстойніках.* Выкарыстоўваюць пры абагачэнні мінер. сыравіны, атрыманні тонкіх парашкоў, ачыстцы глін (кааліну) ад мех. дамешкаў (пяску, слюды, палявога шпату).

**АДНААСО́БНІКІ**, сацыяльная група (або асоба), якая вядзе дробную прыватную гаспадарку або вытворчасць пераважна ўласнымі сродкамі і сіламі сваёй сям'і; паводле афіц. сав. гістарыяграфіі, сяляне ў СССР, якія вялі гаспадарку індывідуальна — аднаасобна, а не ў калгасе ці саўгасе. У 1913 на Беларусі ўдзельная вага сацыяльна падобных да А. катэгорыяй сялян, дробных *саматужнікаў* і *рамеснікаў* складала 74,8% усяго насельніцтва; дробныя гар. і местачковыя саматужнікі і рамеснікі — 34,4% усіх занятых у прам-сці. На іх долю прыпадала прыкладна 26% чыстай прамысл. прадукцыі (у Расіі 31,4%) і 4% нац. прыбытку. Удзельная вага дробных гандляроў складала 43,4% (у Расіі — 29,5%). Да масавай калектывізацыі аднаасобны сялянскі двор у БССР, як і

ў СССР, уяўляў сабой сямейна-прац. аб'яднанне, якое вяло гаспадарку на нацыяналізаванай зямлі. Паводле маёмаснага складу афіцыйна яго падзялялі на бядняцкі, серадняцкі і кулацкі, часам вылучалі і с.-г. рабочых (*парабкаў*). На аснове сав. заканадаўства 1917—20 А., як і інш. сац. групы, былі пазбаўлены права прыватнай уласнасці на зямлю, інш. сродкі вытв-сці, арандаваць і наймаць рабочую сілу, абмежаваны ў самаст. гасп. дзейнасці. На пач. 1920-х г. у ходзе *новай эканамічнай палітыкі* дробнатаварная вытв-сць А. у нар. гаспадарцы была прызнана неабходнай мерай паскарэння сац.-эканам. развіцця. А. дазвалялі любыя формы гасп. дзейнасці, выкарыстанне пры пэўных умовах наёмнай працы, арэнду сродкаў вытв-сці. Сярод А. павялічылася доля заможных гаспадароў і прадпрымальнікаў. Паводле звестак выбарачнага перапісу (1927), сярэдняе сялянства складала 64,7% ад усіх сял. гаспадарак, бедната і парабкі — 31,2%, кулакі — 4,1%. У 1926 сярод насельніцтва БССР сяляне-А., некааператыўныя саматужнікі і рамеснікі складалі 77,5%. У 1925—26 на долю дробнатаварнага і патрыярхальнага ўкладаў у сельскай гаспадарцы прыпадала 79,6% створанага чыстага прадукту, у прам-сці — 32%, у будаўніцтве — да 54%. Усяго А. ствараліі 50,7% нац. прыбытку БССР (у 1913 менш за 40%). У 1926 валавая прадукцыя аднаасобных сял. гаспадарак складала 97,5% агульнарэсп. аб'ёму. З пераходам дзяржавы ад рэфармісцкіх да рэв. метадаў вырашэння задач сац.-эканам. развіцця праз фарсіраваную *індустрыялізацыю* і *калектывізацыю* доля А. у нар. гаспадарцы рэзка зменшылася. Гэтаму спрыяла спыненне продажу ім машын і с.-г. прылад, згортванне выдачы дзярж. крэдытаў, адмова ў праве на арэнду зямлі і прадпрыемстваў, прымяненне павышаных падаткаў і інш. меры. У выпрацаваную камуністамі сістэму буд-ва сацыялізму ў СССР А. не ўпісваліся і былі асуджаны на знікненне. Пачалося імклівае выцісканне А.-прыватніка з усіх сфер дзейнасці. У тавараабароце рэспублікі прыватны сектар у 1926—27 займаў 22,3%, у 1931 — 0,44%, у 1934 яго доля ў легальным гандлі была зведзена да нуля. З саматужна-рамеснай вытв-сці вёскі А. амаль знік у 1930. Няўхільна змяншалася колькасць А. і сярод сялян. У ходзе суцэльнай калектывізацыі ў 1929—32 у БССР кулацтва як клас было ліквідавана (гл. *Раскулачванне*).

Наступ на А. (жорсткае падаткаабкладанне, перадзелы зямлі, ліквідацыя хутарской сістэмы) працягваўся. Толькі ў 1930—35 сума с.-г. падатку з гаспадаркі А. вырасла амаль у 9 разоў. Да канца 1930-х г. самастойная аднаасобная гаспадарка як сац. катэгорыя ў вёсцы і ў горадзе, па сутнасці, знікла (за выключэннем Зах. Беларусі). У 1939 сяляне-А., некааператыўныя саматужнікі і рамеснікі складалі толькі 6,4% усяго насельніцтва БССР. Колькасць аднаасобных сял. двароў зменшылася з 804 тыс. у 1928 да 50,3 тыс. ў 1940. Гэта адмоўна адбілася на ўсёй эканоміцы і асабліва на вытв-сці с.-г. прадукцыі. У пасляваенны час за кошт урбанізацыі рэспублікі, перамяшчэння значнай часткі А. у іншыя раёны СССР, паскорана праведзенай прымусовай калектывізацыі ў Зах. Беларусі аднаасобныя сял. гаспадаркі зусім зніклі. З мноства вяскоўцаў, якія пацярпелі ад рэпрэсій да пач. 1950-х г. (гл. *Рэпрэсіі палітычныя ў СССР*), А. складалі абсалютную большасць. У 1959 сяляне-А. і некааператыўныя саматужнікі складалі толькі 0,7% насельніцтва, у 1966 — 0,1%. Перабудова эканам. структур, пачатая ў канцы 1980-х г. на Беларусі, як і ў цэлым у СССР, стварыла ўмовы для развіцця дробнага прадпрымальніцтва ў горадзе і вёсцы.

*А.М.Сарокін.*

**АДНАБАКО́ВАЯ ПАВЕ́РХНЯ**, паверхня, якая не мае двух розных бакоў, чым і адрозніваецца, напр., ад *сферы, куба* ці *квадрата*. Размешчаная ў прасторы А.п. з зафіксаваным на ёй пунктам неперарыўнай дэфармацыяй абарачальна ператвараецца ў такую, на якой праз гэты пункт будзе праходзіць некаторы замкнёны шлях (абход), уздоўж якога можна пабудаваць нармаль, што неперарыўна мяняе свой кірунак да паверхні; праходзячы гэты шлях, нармаль вяртаецца ў зыходны пункт з напрамкам, процілеглым першапачатковаму. Характарыстыка А.п. — яе неарыентаванасць (гл. *Арыентацыя*). Для трохмернай прасторы сапраўдна і адваротнае: кожная неарыентаваная паверхня будзе А.п. Прыклады А.п.: *Мёбіуса ліст, Клейна паверхня.*

**АДНАГАДО́ВЫЯ РАСЛІ́НЫ**, аднагалетнікі, травяністыя расліны, жыццёвы цыкл якіх (ад насення да насення) заканчваецца на працягу аднаго года (найб. кароткі ён у *эфемераў*, часцей ахоплівае ад 2 да 5 месяцаў). Вядома больш за 100 тыс. відаў, пашыраных на ўсім зямным шары, з іх на Беларусі каля 270 відаў.

А.р. падзяляюцца на яравыя і азімыя формы. Насенне яравых прарастае вясной або летам і да восені (ва ўмераных шыротах) пасля плоданашэння расліны адміраюць (яравая пшаніца, лён, авёс, ячмень, кукуруза, каноплі, гарох, проса, грэчка, рыс і інш.). Азімыя прарастаюць восенню, зімуюць, на наступны год цвітуць, пладаносяць і адміраюць (азімыя пшаніца і жыта, віка, рапс, васілёк, стрэлкі і інш.). А.р. (асабліва эфемераў) значна больш у пустыннай зоне і найменш у тундравай.

**АДНАГАЛО́СНАСЦІ ПРЫ́НЦЫП У ААН**, устаноўлены Статутам ААН парадак прыняцця Саветам Бяспекі рашэнняў непрацэдурнага характару. Прыняты на *Крымскай канферэнцыі 1945.* Паводле А.п. ў ААН рашэнне лічыцца прынятым, калі за яго пададзены галасы 9 членаў Савета, прычым галасы ўсіх яго пастаянных членаў (ЗША, Расіі, Вялікабрытаніі, Францыі і КНР) супадаюць. Часам гэты прынцып называюць правам *вета* пастаянных членаў Савета Бяспекі. Устрыманне пры галасаванні любога пастаяннага члена Савета Бяспекі не перашкаджае ўхваленню рашэння, а няўдзел у галасаванні не разглядаецца як выкарыстанне вета. Прыняцце папраўак і змен у Статуце ААН таксама ажыццяўляецца ў адпаведнасці з А.п. у ААН.

*Л.В.Паўлава.*

**АДНАГАЛО́СЫЯ** (Clamatores, Tyranni), падатр. птушак атр. вераб'інападобных. Пашыраны пераважна ў тропіках Амерыкі. 14 сям.: дрэвалазы (Dendrocolaptidae), печніковыя (Furnariidae), пітавыя (Pittidae) і інш. Каля 1100 відаў.

Даўж. цела да 30 см, маса да 120 г. Будова гартані прымітыўная (крычаць, але не пяюць). Пер'е яркае, стракатае. Гняздуюцца на дрэвах і на зямлі. Нясуць 1—6 яец. Кормяцца насякомымі і раслінамі. Маюць невялікае прамысл. значэнне.

**АДНАДВО́РЦЫ**, катэгорыя дзярж. сялян у Рас. імперыі. Складаліся ў 1-й чвэрці 18 ст. з патомкаў служылых людзей, паселеных царскім урадам у сувязі са стварэннем рэгулярнай арміі на паўд. і паўд.-ўсх. граніцах для іх аховы. А. былі абкладзены падушным падаткам і 4-грыўневым *аброкам*. Пераважная большасць іх не валодала прыгоннымі, мела толькі ўласныя двары (магчыма, адсюль і назва А.).

На Беларусі А. ўтвораны на падставе закону ад 19.10.1831: дробная сельская шляхта была пераведзена ў А. з паліт. (за ўдзел у *паўстанні 1830—31*) і фіскальных меркаванняў. Былі асабіста вольныя; плацілі падатак, выконвалі рэкруцкую павіннасць на працягу 15 гадоў. Паводле ўказа ад 1.8.1857 А. на ўласнай і дзярж. зямлі аднесены да дзярж. сялян, на панскай — да вольных людзей. Фактычна працягвалі існаваць як асобная група сельскага насельніцтва. У 1858 на Беларусі 44 810 А. (1,6% сельскага насельніцтва). Пераважная большасць не мела сваёй зямлі. Па меры *разбору шляхты* колькасць іх расла: у 1867 у Мінскай, Магілёўскай, Віленскай і Гродзенскай губ. было 110 088 чал. Паводле закону ад 19.2.1868 А. пераведзены ў сельскія і гарадскія абшчыны, большасць іх злілася з сялянамі. А., якія жылі на панскай зямлі, не атрымалі права на яе выкуп, тыя, што жылі на дзярж., маглі выкупіць яе. Уласная зямля захавалася за А.

*В.П.Панюціч.*

**АДНАДЗЁНКА**, аднаразовае газетнае выданне. Часам выдавалася як лістоўка або альманах, без нумарацыі. Першая бел. А. «Новіны грозные а жалостливые...» з прычыны нападу Івана IV Грознага на Полацк выд. ў 1563 у Нясвіжскай друкарні. У каталогу 1684 Бадлеанскай (Оксфард) б-кі зафіксавана 7 бел. А. 1563, 1571, 1580, 1597, 1602, 1610 і 1617 на бел., лац., ням., англ. і інш. мовах. У 20 ст. А. выдаваліся найчасцей з-за цэнзурнага ўціску. Выходзілі ў Гродне («Колас беларускай нівы», 1913), Мінску («Над Свіслаччу», май 1914, на польск. мове; «Чырвоная варта», 15.4.1921; «Беларусь — Паволжу», 4.10.1921) і інш. Асн. прычына выхаду А. ў Зах. Беларусі — канфіскацыя бел. прэсы польскімі ўладамі. Яны прысвя-

чаліся пераважна грамадска-паліт. падзеям і выдаваліся ў Вільні («Беларуская крыніца», 25.12.1921; «Беларуская доля», 23.5.1923; «Абух», 20.8.1924; «Беларускі селянін», 14.8.1925; «Новая маланка», 30.11.1928; «Весткі Таварыства Беларускае школы», 28.2.1929; «Беларуская праўда», 12.5.1931; «За беларускую школу», 16.6.1936; «Голас студэнта», 25.6.1937, і інш.), у Гродне («Выстрал», 8.10.1924; «Стрэха», 12.2.1928; «Пралом», 19.6.1929), у Беластоку («Лясны работнік», студз. 1934). Бел. А. выходзілі ў Дзвінску («Праца», 29.6.1928; «Новы шлях», 29.4.1931), Рызе («Шлях праўды», 24.10.1930), Варшаве («Першы крок», ліп. 1935) і інш.; у пасляваенны час — у Нямеччыне, ЗША, Канадзе.

Зберагаюцца ў Нац. б-цы Беларусі, Цэнтр. навук. б-цы АН Беларусі, Цэнтр. навук. б-цы АН Літвы, у архівах і б-ках Польшчы і інш. Усяго выйшла больш за 100 А.

*Літ.:* Максімовіч Р. (Тумаш В.). «Навіны Грозныя» 1563 году: Да гісторыі зачаткаў беларускіх газетных выданняў // Запісы Бел. ін-та навукі і мастацтва. Мюнхен, 1966. Кн. 4; Тое ж // Спадчына. 1994. № 3.

*І.У.Саламевіч.*

**АДНАДО́ЛЬНЫЯ** (Monocotyledonas, Liliopsida), клас кветкавых раслін, гл. *Ліліопсіды*.

**АДНАДО́МНЫЯ РАСЛІ́НЫ**, манагамныя расліны, расліны, у якіх аднаполыя кветкі — мужчынскія (тычынкавыя) і жан. (песцікавыя) або інш. мужчынскія і жан. органы размнажэння (у някветкавых раслін) знаходзяцца на адной расліне. Напр., дрэўныя расліны — бяроза, ляшчына, дуб, сасна, елка; травяністыя — кукуруза, агуркі, гарбузовыя; многія імхі, водарасці. Параўн. *Двухдомныя расліны, Шматдомныя расліны*.

**АДНАДРЭ́ЎКА**, лодка, выдзеўбаная са ствала дрэва; самы старажытны тып лодкі. Бытавала ў славян, у т.л. беларусаў, да з'яўлення дашчаных лодак. Сустракаецца і ў наш час (гл. *Човен*).

**АДНАЗВЯ́ЗНАЯ ВО́БЛАСЦЬ** у матэматыцы, адкрытая ці замкнутая вобласць, у якой любы замкнуты контур можна неперарыўна сцягнуць у пункт, не выходзячы за мяжу вобласці. Для любой замкнутай неперарыўнай крывой, якая належыць А.в., частка плоскасці, якая абмежавана гэтай крывой, належыць вобласці. А.в. з'яўляецца, напр., інтэрвал, сегмент, круг, шар (адкрытыя ці замкнутыя). Мяжа А.в. складаецца з аднаго кавалка. Напр., мяжа круга (А.в.) — акружнасць. Гл. таксама *Мнагазвязная вобласць*.

**АДНАЗНА́ЧНАСЦЬ СЛО́ВА**, тое, што *монасемія*.

**АДНАЗНА́ЧНАЯ ФУ́НКЦЫЯ** (матэм.), *функцыя*, якая прымае толькі адно значэнне для аднаго значэння аргумента з вобласці вызначэння гэтай функцыі, напр., $x^2$, $2^x$, cos x.

**АДНАКАМПЛЕ́КТНАЯ ШКО́ЛА**, пачатковая школа, у якой усе класы вядзе адзін настаўнік. Звычайна працуюць у невял. населеных пунктах пры наяўнасці 4 пач. класаў з агульнай колькасцю да 10 вучняў, якія аб'яднаны ў клас-камплект. Навучанне вядзецца па праграмах для пач. класаў агульнаадук. школы. У 1994/95 навуч. г. на Беларусі было 24 А.ш., колькасць іх паступова скарачаецца.

*Л.І.Дурэйка.*

**АДНАКВЕ́ТКА** (Moneses), род шматгадовых травяністых раслін сям. грушанкавых. Вядомы 1 від — А. буйнакветная (M. uniflora), пашыраны ва ўмераных і халодных зонах Паўн. паўшар'я. Расце ў імшыстых і чарнічных хваёвых лясах, на купінах нізінных і пераходных балот, у гарах уздымаецца да субальпійскага пояса на выш. да 2,4 тыс. м над узр. м. На Беларусі трапляецца пераважна ў паўн. раёнах.

Выш. 3—17 см. Лісце супраціўнае, акруглае, скучанае ў ніжняй ч. сцябла. Карэнішча

**Аднакветка буйнакветная.**

паўзучае. Кветкі адзіночныя, белыя, вельмі духмяныя. Цвіце ў чэрв. — пач. ліпеня. Плод — шарападобная шматнасенная каробачка. Лек. расліна, выкарыстоўваецца як сродак ад вочных захворванняў.

**АДНАКЛА́СНАЕ ПАЧАТКО́ВАЕ ВУЧЫ́ЛІШЧА**, навучальная ўстанова ў Рас. імперыі. На Беларусі першыя А.п.в. існавалі пры манастырах каталіцкіх ордэнаў. Паводле Статута для прыходскіх вучылішчаў 1807 для дзяцей бедных рамеснікаў і сялян ствараліся А.п.в. з адным настаўнікам, якія мелі 6-месячны тэрмін навучання. Вучэбныя планы абмяжоўваліся практычнымі мэтамі. Паводле Статута 1828 дзейнасць А.п.в. мела саслоўны характар. «Часовыя правілы для народных школ...» 1863 дазвалялі прыём у А.п.в. дзяцей усіх саслоўяў і веравызнанняў; выкладалі Закон Божы, рус. мову, першыя чатыры дзеянні арыфметыкі, спевы. У сярэдзіне 1870-х г. на Беларусі было 50 А.п.в. (36 з іх мелі жан. змены), у пач. 1890-х г. — 70 з 2-гадовым тэрмінам навучання. Паводле «Палажэння аб царкоўных школах праваслаўнага веравызнання» (1902) існавалі аднакласныя пач. школы царк. ведамства з 3-гадовым тэрмінам навучання (гл. *Царкоўнапрыходскія школы*). З павелічэннем ролі земстваў (1911) А.п.в. царк. ведамства не вытрымалі канкурэнцыі з земскімі школамі, дзе даваліся больш глыбокія веды, і сталі пераходзіць на земскае ўтрыманне (Віцебская, Магілёўская, Мінская губерні).

*С.В.Снапкоўская.*

**АДНАКЛЕ́ТАЧНЫЯ**, арганізмы, целы якіх складаюцца з адной клеткі. Існуюць 2 узроўні арганізацыі А.: пракарыётны (бактэрыі і сіне-зялёныя водарасці) і эўкарыётны (зялёныя і інш. водарасці, прасцейшыя). У пракарыётаў няма дыферэнцыраванага клетачнага ядра, у эўкарыётаў яно ёсць і можа дзяліцца. А. спалучаюць уласцівасці клеткі і самаст. арганізма. Маюць простую будову (хларэлы, амёбы) і складаную (ацэтабулярыі, інфузорыі). Многія ўтвараюць калоніі. Ад А. узніклі шматклетачныя.

**АДНАКЛЕ́ТАЧНЫЯ ВО́ДАРАСЦІ**, гл. ў арт. *Водарасці*.

**АДНАЛЕ́ТНІКІ**, тое, што *аднагадовыя расліны*.

**АДНАМЕ́РНАГА ЧАЛАВЕ́КА КАНЦЭ́ПЦЫЯ**, найбольш поўнае выражэнне «крытычнай тэорыі грамадства», звязанай з даследаваннямі сац. *канфармізму* і сац.-псіхал. тыпаў асобы. Назва ад кнігі заснавальніка гэтай канцэпцыі Г.Маркузе «Аднамерны чалавек. Нарысы ідэалогіі высокаразвітога індустрыяльнага грамадства». Істотную ролю ў станаўленні канцэпцыі адыгралі ідэі З.Фрэйда, В.Райха, Т.Адорна, Э.Фрома і інш. даследчыкаў механізмаў адчужэння чалавека.

Аднамернасць як разбурэнне чалавечай суб'ектыўнасці Маркузе звязваў з развітой індустрыяльнай цывілізацыяй, рэпрэсіўным уздзеяннем тэхнікі на духоўны свет асобы. «Аднамерны чалавек» — канфарміст, які поўнасцю інтэграваны ў «сістэму», лёгка паддаецца маніпуліраванню, яго адносіны да свету павярхоўныя, некрытычныя, схільнасці і патрэбы скажоны прынцыпам прадукцыйнасці, што выклікае спажывецкую арыентацыю. Аднамернасці процістаўляецца двухмернасць чалавека, якая дапускае наяўнасць унутранага свету асобы, здольнасць яе крытычна ставіцца да ўмоў свайго існавання і самаўдасканальвацца.

*Літ.:* Баталов Э.Я. Философия бунта. М., 1973; Marcuse H. One — demensional man. London, 1991.

*А.В.Рубанаў.*

**АДНАПАЛО́СНАЯ МАДУЛЯ́ЦЫЯ**, працэс атрымання мадуляваных ваганняў, частотны спектр якіх мае адну бакавую паласу частот (нясучая частата і другая бакавая паласа значна прыглушаны). У параўнанні з *амплітуднай мадуляцыяй* пры А.м. перадавальны спектр частот скарачаецца ў 2 разы, што дазваляе падвоіць колькасць каналаў сувязі. Агульны выйгрыш па магутнасці перадатчыка ў 8—16 разоў. Выкарыстоўваецца ў тэлебачанні, прафес. і аматарскай радыёсувязі, правадной сувязі.

**АДНАПО́ЛЫЯ КВЕ́ТКІ**, кветкі, у якіх ёсць толькі тычынкі і няма песціка (песцікаў) або ёсць толькі песцік (песцікі), але няма тычынак. Першыя наз. тычынкавыя (мужч.), другія — песцікавыя (жан.). У многіх А.к. органы другога полу захоўваюцца ў рэдукаваным стане і не функцыяніруюць. Паводле эвантавай тэорыі паходжання кветкі, А.к. ўзніклі ў працэсе эвалюцыі ад двух кветак у выніку прыстасавання да апылення ветрам. Такія кветкі наз. функцыянальна-мужчынскімі або функцыянальна-жаночымі. Размеркаванне А.к. на раслінах рознае (гл. *Аднадомныя расліны, Двухдомныя расліны, Шматдомныя расліны*).

**АДНАПО́ЛЮСНАЕ ТЭЛЕГРАФАВА́ННЕ**, тэлеграфаванне сігналамі пастаяннага току, якія ўяўляюць сабой кодавую камбінацыю імпульсаў адной палярнасці з бястокавымі інтэрваламі. У адрозненне ад *двухполюснага тэлеграфавання* выкарыстоўваецца на лініях сувязі невял. працягласці (да 300 км).

**АДНАПРАХО́ДНЫЯ** (Monotremata), яйцародныя, атрад найб. прымітыўных сярод сучасных млекакормячых. Вядомы з плейстацэну Аўстраліі. 2 сям.: *яхідны* і *качканосы*, 5 відаў. Пашыраны ў Аўстраліі, Тасманіі, Новай Гвінеі.

Даўж. цела да 80 см. Характэрна сумяшчэнне заднепраходнай і мочапалавой адтулін (клаака, як у птушак). Зубоў у дарослых няма. Страўнік не мае стрававальных залоз. Сярэдняя т-ра цела ніжэйшая, чым у інш. млекакормячых (25—36 °С). Нясуць 1—2, зрэдку 3 яйцы. Малочныя залозы трубчастыя, выдзяляюць малако на брушную паверхню цела (залозістае поле), адкуль яго злізваюць дзіцяняты. Паўводныя ці наземныя формы. Кормяцца жывёльнымі арганізмамі. Колькасць невялікая.

**АДНАРО́Г**, нарвал (Monodon monoceros), марское млекакормячае атр. кітападобных. Жыве ў арктычных водах Грэнландыі, Паўн. Канады, Шпіцбергена і ПнУ Зямлі Франца-Іосіфа.

Даўж. да 6,1 м, маса 1—1,5 т. Афарбоўка светлая з мноствам чорных плямаў (дзіцяняты цёмныя). У самцоў (зрэдку ў самак) у левай верхняй сківіцы бівень (рог) даўж. да 3 м (адсюль назва), якім яны прабіваюць адушыны ў ільдах. Корміцца галаваногімі малюскамі і рыбай. Рэдкі. Ахоўваецца, занесены ў Чырв. кнігу СССР.

**АДНАРО́Г** (лац. Monoceros), экватарыяльнае сузор'е з найбольш яркай зоркай 3,8 візуальнай *зорнай велічыні*. На тэр. Беларусі найлепшы час назірання — снежань, студзень.

**АДНАРО́Г** (ад назвы міфічнага звера з рогам на лбе), старажытная руская артылерыйская гладкаствольная гармата. А. — пішчаль-інрог, адліты ў 1577. У 1757—59 распрацавана некалькі ўзораў А., якія мелі ствалы 7,5—12,5 калібра з ядрамі 1,8—40 кг. 246-міліметровы А. страляў на адлегласць да 4 км ядрамі, разрыўнымі і запальнымі гранатамі, бомбамі і карцеччу. Быў на ўзбраенні рус. артылерыі больш за 100 гадоў (да стварэння наразных гармат).

**АДНАРО́ДНАЕ ЎРАЎНЕ́ННЕ**, ураўненне, якое не змяняе свайго выгляду пры адначасовым множанні ўсіх (або толькі некаторых) пераменных на адзін і той жа адвольны лік. Ураўненне можа быць аднародным і ў адносінах да адпаведных пераменных, напр., $xy + yz + zx = 0$ — А. ў. ў адносінах да ўсіх пераменных, ураўненне $y + \ln(x/z) + 5 = 0$ — да x і z. Левая частка А.ў. з'яўляецца *аднароднай функцыяй*.



Аднарог: 1 — самец; 2 — самка.

**АДНАРО́ДНАСЦЬ СУСВЕ́ТУ**, аднароднае размеркаванне рэчыва, што назіраецца ў межах *Метагалактыкі*. Лічыцца, што ў прасторы, маштабы якой у трох вымярэннях перавышаюць адлегласць у 50 Мпк і якая ўключае каля 6000 *галактык*, шчыльнасць рэчыва прыблізна аднолькавая.

**АДНАРО́ДНАЯ ФУ́НКЦЫЯ**, *функцыя* адной або некалькіх пераменных, якая адпавядае ўмове: пры адначасовым множанні ўсіх пераменных на адзін і той жа адвольны лік значэнне функцыі памнажаецца на некаторую ступень гэтага ліку.

Напр., $f(\lambda x, \lambda y, ..., \lambda u) = \lambda^n f(x,y,...,u)$, дзе n — паказчык аднароднасці, або вымярэння А.ф. Сустракаюцца ў геам. формулах. Калі $x = f(a, b,..., l)$, дзе a, b,..., l — даўжыні адрэзкаў, вымераных адным адвольным маштабам, то правая частка выразу павінна быць А.ф. (вымярэнне 1, 2 або 3 у залежнасці ад таго, што вызначае x — даўжыню, плошчу або аб'ём).


Аднарог. 18 ст.

**АДНАРО́ДНЫЯ КААРДЫНА́ТЫ** пункта, прамой і г.д., каардынаты з уласцівасцю, што аб'ект, які яны вызначаюць, не мяняецца, калі ўсе каардынаты памножыць на адвольны лік.

Напр., А.к. пункта M на плоскасці могуць з'яўляцца лікі x, y, z, звязаныя суадносінамі $x : y : z = x : y : 1$, дзе x і y — дэкартавы каардынаты пункта M. Лікі x', y' z' будуць А.к. таго ж пункта M у выпадку, калі знойдзецца множнік λ, што $x' = \lambda_x$, $y' = \lambda_y$, $z' = \lambda_z$.

Увядзенне А.к. дазваляе дадаць да пунктаў эўклідавай плоскасці пункты з трэцяй А.к., роўнай нулю (т. зв. бесканечна аддаленыя пункты), што істотна для *праектыўнай геаметрыі*.

**АДНАРО́ДНЫЯ ЧЛЕ́НЫ СКА́ЗА**, члены сказа, якія адносяцца да аднаго і таго ж слова і выконваюць аднолькавую сінтаксічную функцыю. Паміж сабой звязваюцца спалучальнай сувяззю, сродкам выражэння якой служаць або інтанацыя пералічэння, або інтанацыя і спалучальныя злучнікі.

Аднароднымі могуць быць і галоўныя, і даданыя члены сказа: «Тут было і **здзіўленне, і захапленне,** і крыху **зайздрасці**» (М.Лынькоў) — аднародныя дзейнікі; «**За гарамі, за далямі,** у балотах пустынных **паўставала, вырастала** новая краіна» (Я.Купала) — аднародныя акалічнасці і выказнікі; «На бітву грозную ішоў народ **за пчасце, за зямлю, за долю**» (Р.Няхай) — аднародныя дапаўненні; «На дварэ другі дзень сеяў **дробны,** але **густы** дождж» (І.Шамякін) — аднародныя азначэнні. Аднароднымі могуць быць члены сказа, выражаныя рознымі часцінамі мовы: «Ліда вясёлая па натуры і любіць смяяцца» (А.Кулакоўскі). А.ч.с. ўтвараюць адкрыты, незамкнёны рад, у які можа ўваходзіць абагульняльнае слова: «Будынак, парк і агарожа — было ўсё слаўна і прыгожа» (Я.Колас).

*А.Я.Міхневіч.*

**АДНАСЕМЯДО́ЛЬНЫЯ**, тое, што *ліліопсіды*.

**АДНАСКЛА́Д**, аднаўлен, у матэматыцы, здабытак, які складаецца з лікавага множніка (каэфіцыента) і адной або некалькіх літар (пераменных), кожная з якіх узята з тым або іншым цэлым дадатным паказчыкам ступені; самы просты алг. выраз. Напр., $-5ax^3$; $+a^3c^3xy$; -7; -a.

**АДНАСТРО́ФНЫ ВЕРШ**, верш, які не падзелены на асобныя строфы і ўяўляе сабой адно інтанацыйна-сінтаксічнае цэлае. Звычайна ўключае ад 2 да 8 вершарадоў. Да А.в. адносяць і класічны *санет*, у якім і тэрцэты, і катрэны звязаны паміж сабой аднолькавымі рыфмамі.

**АДНАЎЛЕ́ННЕ**, гл. ў арт. *Акісленне-аднаўленне*.

**АДНАЎЛЕ́ННЕ ЛЕ́СУ**, адбываецца пад полагам дрэвастою, на высечках, гарах і інш. участках, якія раней былі пад лесам. Бывае прыроднае, штучнае і

камбінаванае. Прыроднае А.л. — біял. самааднаўленне лесу самасевам, пнёвымі і каранёвымі парасткамі. Працякае больш эфектыўна, калі на высечках пакідаюць пэўную колькасць насенных дрэў, лесасекі ачышчаюць ад рэшткаў драўніны, а глебу на іх пэўным чынам апрацоўваюць. Фіз.-геагр. асяроддзе для прыроднага насеннага А.л. больш спрыяльнае ў лясной зоне, асабліва ў тайзе, дзе менш падлеску і травяністай расліннасці; горш працякае ў лесастэпавай, стэпавай, паўпустыннай зонах і прытундравай падзоне. Часта пры прыродным А.л. адбываецца змена парод і ўтварэнне т.зв. вытворных лясоў: бярэзнікаў, алешнікаў, грабнякоў, асіннікаў і да т.п. Штучнае А.л. — пасевы насення, пасадка сеянцаў, саджанцаў, сцябловых і каранёвых чаранкоў. Праводзяць на ўчастках, дзе прыроднае А.л. не дае добрых вынікаў. На тэр. Беларусі яно арыентавана пераважна на вырошчванне хвоі, елкі, дубу, лістоўніцы і інш. (у лясах дзярж. фонду штогод праводзіцца на пл. каля 34 тыс. га). Камбінаванае (мяшанае), спалучае прыроднае і штучнае А.л. на адной і той жа плошчы.

**АДНАЧАСО́ВАСЦЬ**, супадзенне па часе з'яў, аддзеленых адна ад адной у прасторы. У класічнай механіцы існавала ўяўленне пра абсалютную прастору і час, пра адзіны паток часу, што аднастайна працякае ўсюды і складаецца з імгненняў, кожнае з якіх адначасова настае ва ўсіх пунктах прасторы. Гэта ўяўленне грунтавалася на дапушчэнні бесканечнай скорасці распаўсюджання светлавых сігналаў. *Адноснасці тэорыя*, зыходзячы з канечнасці скорасці святла, адмовілася ад паняцця абсалютнай А. Атаясамліванне момантаў часу дзвюх з'яў мае сэнс, калі гэтыя з'явы разглядаюцца ў межах нейкай пэўнай *сістэмы адліку*. З'явы, адначасовыя ў адной сістэме адліку, могуць аказацца неадначасовымі ў інш. сістэме.

**АДНАЧЛЕ́Н**, тое, што *аднасклад*.

**АДНІМА́ННЕ**, адыманне, арыфметычнае дзеянне, якое заключаецца ў знаходжанні аднаго са складаемых па вядомай суме і другім складаемым; процілеглае *складанню*. Сума ў гэтым выпадку наз. памяншаемым, дадзенае складаемае — аднімаемым, невядомае (вынік) — рознасцю. Каб ад аднаго ліку адняць другі, дастаткова да памяншаемага дадаць лік, процілеглы аднімаемаму. Напр.: 7 - 5 = = 7 + (-5) = 2; a - b = a + (-b).

**АДНО́СІН ТЭО́РЫЯ**, раздзел *фармальнай логікі*, дзе разглядаюцца агульныя ўласцівасці адносін і законы, якім яны падпарадкоўваюцца. Распрацавана А. дэ *Морганам*, Ч.С.*Пірсам* і Э.*Шрэдэрам*. Асн. кірунак — вылічэнне адносін, блізкае да тэорыі класаў; даследаванне сувязі паміж адносінамі і аперацыі над імі, устанаўленне законаў, пры дапамозе якіх з адных адносін можна вывесці другія. У матэм. логіцы А.т. звязана з вывучэннем уласцівасцяў і вылічэннем *прэдыкатаў*, адносін тоеснасці, роўнасці, прыналежнасці элемента да пэўнага класа аб'ектаў і інш.

**АДНО́СІНЫ**, 1) філасофская катэгорыя, якая адлюстроўвае адзін з аб'ектыўных момантаў узаемасувязі рэчаў, абумоўленай матэрыяльным адзінствам свету. Існаванне, спецыфічныя ўласцівасці і развіццё рэчаў залежаць ад сукупнасці іх А. да інш. рэчаў. Паняцце аб А. узнікае як вынік параўнання дзвюх ці больш рэчаў па выбранай (зададзенай) аснове (прыкмеце). Калі аснова параўнання не адвольная, то і А. як вынік параўнання таксама не адвольныя, іх анталагічны статус у дадзеным выпадку праяўляецца ў існаванні асновы (пры гэтым самі А. можна разглядаць як уласцівасць гэтай асновы).

Адрозніваюць унутраныя А. частак рэчы і яе знешнія А. з інш. рэчамі, А. істотныя і неістотныя, неабходныя і выпадковыя і інш. Істотныя агульныя ўстойлівыя А. паміж з'явамі выступаюць як закон іх развіцця і функцыяніравання. Асаблівы характар маюць *грамадскія адносіны*, вывучэнне якіх дае ключ да разумення сутнасці чалавека і гісторыі грамадства. Тыпы і ўласцівасці А., законы іх узаемасувязі вывучаюцца тэорыяй пазнання, логікай, матэматыкай, агульнай тэорыяй сістэм. 2) Эмацыянальна-валявая ўстаноўка асобы на што-небудзь (выказванне яе пазіцыі).

*Літ.:* Уемов А.И. Вещи, свойства и отношения. М., 1963; Райбекас А.Я. Вещь, свойство, отношение как философские категории. Томск, 1977; Проблема связей и отношений в материалистической диалектике. М., 1990.

*У.К.Лукашэвіч.*

**АДНО́СІНЫ** двух лікаў, дзель аднаго ліку на другі. А. дзвюх аднародных велічынь наз. лік, які атрымліваецца ў выніку вымярэння першай велічыні, калі другая прынята за адзінку. Калі 2 велічыні вымераны з дапамогай адной і той жа адзінкі, то іх А. роўныя А. лікаў, якія іх вымяраюць. А. даўжынь 2 адрэзкаў выражаюцца рацыянальным (сувымерныя адрэзкі) або ірацыянальным (несувымерныя адрэзкі) лікам. Паводле Эўкліда, 4 адрэзкі a, b, a', b' утвараюць прапорцыю a : b = a' : b', калі для адвольных натуральных лікаў m і n выконваецца адна з суадносін ma = nb, ma > nb, ma < nb адначасова з адпаведнымі суадносінамі ma' = nb', ma' > nb', ma' < nb'. У выпадку несувымернасці a і b — разбіўка ўсіх рацыянальных лікаў x = m/n на 2 класы па прыкмеце a > xb або a < xb супадае з разбіўкай па прыкмеце a' > xb' або a' < xb', што адпавядае сутнасці ідэі сучаснай тэорыі *дэдэкінда сячэнняў*.

**АДНО́СНАЕ**, гл. *Абсалютнае і адноснае*.

**АДНО́СНАСЦІ ПРЫ́НЦЫП**, пастулат спецыяльнай *адноснасці тэорыі*, паводле якога ў адвольных інерцыяльных сістэмах адліку ўсе фіз. (мех., электрамагн. і інш.) з'явы пры адных і тых жа ўмовах працякаюць аднолькава. Справядлівасць А.п. вызначае, што станы спакою і раўнамернага прамалінейнага руху не адрозніваюцца паміж сабой. Сфармуляваны ў 1905 А.*Эйнштэйнам* як абагульненне мех. прынцыпу адноснасці на ўсе фіз. з'явы (за выключэннем гравітацыйных).

**АДНО́СНАСЦІ ТЭО́РЫЯ**, фізічная тэорыя прасторы і часу ў іх сувязі з матэрыяй і законамі яе руху. Падзяляецца на спецыяльную (СТА) і агульную (АТА). СТА створана ў 1904—08 у выніку пераадольвання цяжкасцяў, якія ўзніклі ў класічнай фізіцы пры тлумачэнні аптычных (электрадынамічных) з'яў у рухомых асяроддзях (гл. *Майкельсана доследы*). Заснавальнікі СТА — Г.А.Лорэнц, А.Пуанкарэ, А.Эйнштэйн, Г.Мінкоўскі.

У працы Эйнштэйна «Да электрадынамікі

Аднаўленне лесу.

рухомых цел» (1905) сфармуляваны 2 асн. пастулаты СТА: эквівалентнасць усіх *інерцыйных сістэм адліку* (ІСА), пры апісанні не толькі мех., а таксама аптычных, эл.-магн. і інш. працэсаў (спец. *адноснасці прынцып*); пастаянства скорасці святла ў *вакууме* ва ўсіх ІСА; незалежнасць яе ад руху крыніц і прыёмнікаў святла. Пераход ад адной ІСА да ўсякай іншай ІСА адбываецца з дапамогай *Лорэнца пераўтварэнняў*, якія вызначаюць характэрныя прадказанні СТА: скарачэнне падоўжных памераў цела, запавольванне часу і нелінейны закон складання скарасцей, згодна з якім у прыродзе не можа адбывацца рух (перадача сігналаў) са скорасцю, большай за скорасць святла ў вакууме. СТА — фіз. тэорыя працэсаў, для якіх уласцівы вял., блізкія да скорасці святла с у вакууме скорасці руху. У тым выпадку, калі скорасць v намнога меншая за скорасць святла (v << c), усе асн. палажэнні і формулы СТА пераходзяць у адпаведныя суадносіны класічнай механікі. Раздзелы фізікі, у якіх неабходна ўлічваць адноснасць адначасовасці (з дакладнасцю да $v^4/c^2$ і вышэй), наз. рэлятывісцкай фізікай. Першай створана *рэлятывісцкая механіка*, у якой устаноўлены залежнасці поўнай энергіі E і імпульса $\vec{p}$ цела масы m ад скорасці руху v:

$$E = \frac{m c^2}{\sqrt{1 - v^2/c^2}}, \quad \vec{p} = \frac{m \vec{v}}{\sqrt{1 - v^2/c^2}},$$

адкуль вынікае ўзаемасувязь энергіі спакою цела з яго масай: $E_0 = mc^2$. На падставе аб'яднання СТА і *квантавай механікі* пабудаваны рэлятывісцкая квантавая механіка і рэлятывісцкая *квантавая тэорыя поля*, якія з'явіліся тэарэт. асновай фізікі элементарных часціц і фундаментальных узаемадзеянняў. Усе асн. палажэнні і прадказанні СТА і пабудаваных на яе аснове фіз. тэорый знайшлі пацвярджэнне ў эксперыментах, выкарыстоўваюцца пры вырашэнні практычных задач ядз. энергетыкі, праектаванні і эксплуатацыі паскаральнікаў зараджаных часціц і г.д. Агульная тэорыя адноснасці (АТА), створаная Эйнштэйнам (1915—16) як рэлятывісцкая (геаметрычная) тэорыя *гравітацыйных узаемадзеянняў*, вызначыла новы ўзровень навук. поглядаў на прастору і час. Яна пабудаваная на падставе СТА як рэлятывісцкае абагульненне тэорыі сусветнага прыцягнення Ньютана на моцныя гравітацыйныя палі і скорасці руху, блізкія да скорасці святла. АТА апісвае прыцягненне як

уздзеянне гравітацыйнай масы рэчыва і поля згодна з *эквівалентнасці прынцыпам* на ўласцівасці 4-мернай прасторы-часу. Геаметрыя гэтай прасторы перастае быць эўклідавай (плоскай), а становіцца рыманавай (скрыўленай). Гэта азначае, што кожнаму пункту прасторы-часу адпавядае свая метрыка, сваё скрыўленне. Пераўтварэнні Лорэнца ў АТА таксама залежаць ад каардынат прасторы і часу, становяцца лакальнымі, таму можна гаварыць толькі аб лакальным выкананні законаў СТА у АТА. Ролю гравітацыйнага патэнцыялу адыгрывае метрычны тэнзар, які вызначаецца як рашэнне ўведзеных у АТА нелінейных ураўненняў гравітацыйнага поля (ураўненняў Гільберта—Эйнштэйна). У АТА прымаецца, што гравітацыйная маса скрыўляе трохмерную прастору і змяняе працягласць часу тым больш, чым большая гэта маса (большае прыцягненне). У АТА рух цел па інерцыі (пры адсутнасці вонкавых сіл негравітацыйнага паходжання) адбываецца не па прамых лініях з пастаяннай скорасцю, а па скрыўленых лініях з нераменнай скорасцю. Гэта значыць, што ў малой частцы прасторы-часу, дзе гравітацыйнае поле можна лічыць аднародным, створаны ім эфект эквівалентны эфекту, абумоўленаму паскораным (неінерцыяльным) рухам адпаведнай *сістэмы адліку*. Таму АТА, у якой паняцце ІСА па сутнасці не мае сэнсу, наз. тэорыяй неінерцыйнага руху. Асн. гравітацыйныя эфекты, прадказаныя ў АТА, пацверджаны эксперыментальна. АТА адыграла вял. ролю ў фарміраванні сучаснай *касмалогіі*.

На Беларусі навук. даследаванні па СТА і АТА пачаліся ў 1928—29 (Ц.Л.Бурстын, Я.П.Громер) і атрымалі інтэнсіўнае развіццё ў АН, БДУ і інш.

*Літ.:* Эйнштэйн А. Сущность теории относительности. М., 1955; Фок В.А. Теория пространства, времени и тяготения. М., 1961; Ландау Л.Д., Лифшиц Е.М. Теория поля. М., 1967; Синг Дж.Л. Общая теория относительности: Пер. с англ. М., 1963; Фёдоров Ф.И. Группа Лоренца. М., 1979; Левашев А.Е. Движение и двойственность в релятивистской электродинамике. Мн., 1979; Иваницкая О.С. Лоренцев базис и гравитационные эффекты в эйнштейновской теории тяготения. Мн., 1979.

*А.А.Богуш.*

**АДНО́СНАЯ БІЯЛАГІ́ЧНАЯ ЭФЕКТЫ́ЎНАСЦЬ** выпрамяненняў, паказчык колькаснага параўнання біял. ўздзеяння розных відаў радыеактыўнага выпрамянення. Вызначае, у колькі разоў *біялагічнае дзеянне іанізавальных выпрамяненняў* пэўнага тыпу (напр., альфа-, бэта-выпрамяненне, нейтроны і інш.) большае (ці меншае) за ўздзеянне на той жа біял. аб'ект стандартнага выпрамянення (жорсткіх рэнтгенаўскіх ці гама-прамянёў). Асобныя віды выпрамяненняў суправаджаюцца вызваленнем рознай колькасці энергіі і маюць пэўную пранікальную здольнасць, таму па-рознаму ўздзейнічаюць на жывыя арганізмы. Чым больш энергіі выпрамяненне перадае тканкам, тым больш пашкоджанняў атрымлівае жывы арганізм. Напр., альфа-выпрамяненне (паток цяжкіх часціц — нейтронаў і пратонаў) мае невял. пранікальную здольнасць, што не дазваляе пранікнуць праз вонкавы слой скуры, аднак яно лічыцца найбольш небяспечным пры траплянні радыенуклідаў унутр арганізма праз раны, з ежай ці пры ўдыханні. А.б.э. для электроннага, пазітроннага, рэнтгенаўскага і гама-выпрамянення, а таксама хуткіх пратонаў блізкая да 1, для альфа-часціц і хуткіх нейтронаў роўная 10, для цяжкіх шматзарадных іонаў і ядраў аддачы — 20.

**АДНО́СНАЯ ВЫШЫНЯ́**, адлегласць па вертыкалі ад пункта на паверхні зямлі да якога-н. адвольна прынятага за нуль узроўню. Паказвае, наколькі адзін пункт зямной паверхні перавышае другі (напр., выш. горнай вяршыні над яе падэшвай).

**АДНО́СНАЯ І́СЦІНА**, гл. ў арт. *Ісціна*.

**АДНО́СНЫ РУХ**, рух матэрыяльнага пункта (цела) адносна сістэмы адліку, якая сама рухаецца адносна інш. сістэмы адліку, што ўмоўна прымаецца за нерухомую. Звычайна нерухомая сістэма адліку (К) лічыцца *інерцыйнай сістэмай адліку*; рухомая сістэма (К') можа быць інерцыяльнай і неінерцыяльнай. Скорасць і паскарэнне цела адносна сістэмы К' наз. адноснымі ($\vec{v}_{ад}$, $\vec{a}_{ад}$), адносна сістэмы К — абсалютнымі ($\vec{v}_{аб}$, $\vec{a}_{аб}$), скорасць і паскарэнне сістэмы К' адносна К — пераноснымі ($\vec{v}_{пер}$, $\vec{a}_{пер}$). У кінематыцы паміж гэтымі велічынямі ўстаноўлена залежнасць: $\vec{v}_{аб} = \vec{v}_{ад} + \vec{v}_{пер}$; $\vec{a}_{аб} = \vec{a}_{ад} + \vec{a}_{пер} + \vec{a}_{кар}$, дзе $\vec{a}_{кар}$ — *Карыяліса паскарэнне*.

**АДО́ЕЎСКІ** Аляксандр Іванавіч

У.Ф.Адоеўскі.

(8.12.1802, Санкт-Пецярбург — 27.8.1839), рускі паэт-дзекабрыст. За ўдзел у паўстанні 1825 асуджаны на катаргу. Аўтар элегій, гіст. паэмы «Васілька» (1829—30), вершаў «У Сібіры», «Трызна», «Вешчых струн палымяныя гукі» і інш. Паэтызаваў рэв. подзвіг, грамадз. мужнасць, ідэі свабоды, любові да радзімы, асуджаў тыранію.

*Тв.:* Полн. собр. стихотворений и писем. М.; Л., 1934; Стихотворения. М., 1982.

**АДО́ЕЎСКІ** Уладзімір Фёдаравіч (11.8.1803 ці 1804, Масква — 11.3.1869), рус. пісьменнік, філосаф, муз. і літ. крытык, заснавальнік рус. класічнага музыказнаўства. Старшыня «Таварыства любамудрыя» (1823—25). Аўтар фантаст. апавяданняў «Розныя казкі з трапным слоўцам, сабраныя Ірынеем Мадэставічам Гамазейкам» (1833), «Жывы мярцвяк» (1844), сатыр. свецкіх («Княжна Мімі», 1834; «Княжна Зізі», 1839) і містыка-фантаст. («Сільфіда», 1837; «Космарама», «Саламандра», абедзве 1840; «Шалёныя», 1842) аповесцяў, артыкулаў і эсэістычных нататкаў пра А.Пушкіна і М.Гогаля. Духоўную атмасферу 1830-х г. перадаў у рамане «Рускія ночы» (1844, 2-я рэд. 1862, апубл. 1913), які спалучае філас. дыялогі, апавяданні-прытчы, навелы. Распрацоўваў муз.-тэарэт. і эстэт. праблемы, даследаваў нар. песню, старарус. музыку. Аўтар біягр. апавяданняў і муз.-крытычных эсэ.

*Тв.:* Соч. Т. 1—2, М., 1981; Музыкально-литературное наследие. М., 1956.

**АДО́ЕЎЦАВА** Ірына Уладзіміраўна (сапр. Іванова Іраіда Густаваўна; 4.8.1895, Санкт-Пецярбург — 15.10.1990), рус. пісьменніца. У 1922—87 у эміграцыі. Аўтар зб-каў лірычных вершаў «Двор цудаў» (1922), «Кантрапункт» (1950), «Залаты ланцуг» (1970) і інш.; аповесцяў і раманаў, у т.л. «Пакінь надзею назаўсёды» (1954) пра жыццё ў СССР у 1930-я г. Апублікавала кн. ўспамінаў «На берагах Нявы»

(1967), «На берагах Сены» (1978—81, абедзве выд. ў СССР, 1988). Адметныя рысы творчай манеры — яснасць, класічная прастата і дакладнасць, у ёй выразна адчуваецца літ. школа акмеізму.

**АДО́КСА** (Adoxa), род шматгадовых травяністых раслін сям. адоксавых. Некалькі відаў (раней род лічыўся манатыпным). Растуць ва ўмераным і халодным паясах Паўн. паўшар'я, у гарах да альпійскага пояса. Найб. вядома А. мускусная, або мускусніца мускусная (A. moschatellina), сустракаецца па ўсёй тэр. Беларусі ў шыракалістых і мяшаных лясах, на схілах, у старых парках. Рэлікт даледавіковага часу.

Выш. 5—15 см. Карэнішча кароткае, паўзучае, белаватае. Лісце са слабым мускусным пахам (адсюль назва). Цвіце вясной адна з першых. Кветкі дробныя, жаўтавата-зялёныя або зеленавата-белыя. Плод — зялёная касцянка з 1—5 костачкамі. Карані (збіраюць увосень) выкарыстоўваюць як антысептычны і гаючы сродак.

**АДО́ЛЬСКАЯ** (Адамовіч) Мар'яна (1767?, Паставы — ?), танцоўшчыца. Прыгонная А.*Тызенгаўза*. Вучылася ў яго балетных школах у Гродне (у Г.Петынеці) і Паставах (у Ле Ду). У 1778 саліравала ў школьным спектаклі «Сялянскі балет» Петынеці, выступала ў балеце «Шлюб самнітаў» (1783) і інш. на сцэне Гродзенскага т-ра Тызенгаўза. Пасля смерці Тызенгаўза (1785) перададзена каралю Станіславу Аўгусту Панятоўскаму і ўвайшла як другая салістка ў трупу «Т-ва танцоўшчыкаў яго каралеўскай вялікасці». У 1789 пакінула сцэну.

*Г.І.Барышаў.*

**АДО́НІС**, грэчаская назва фінікійска-сірыйскага бога раслінасці і ўрадлівасці. У міфалогіі Грэцыі А. — каханы *Афрадыты*. Паводле міфаў, памёр ад раны, але ўваскрэс і ўзнёсся на неба. Культ А. вядомы з 2-га тыс. да н.э., паўплываў на ўзнікненне міфа пра ўваскрэсенне і ўзнясенне Ісуса Хрыста. Да міфа аб А. звярталіся ў л-ры Авідзій, Лопэ дэ Вэга, У.Шэкспір, у жывапісе — Тыцыян, Рубенс, Пусэн і інш.

**АДО́НІС**, малая планета. Адкрыта Э.Дэльпортам (Бельгія, 1936). Абарачаецца вакол Сонца па выцягнутай эліптычнай арбіце з перыядам 2,76 г. Папярочнік А. каля 1 км; адлегласць ад Сонца 0,44—3,50 а.а. Найменшая адлегласць ад Зямлі каля 2 млн. км.

**АДО́НІС** (Adonis), род адна- і шматгадовых травяністых раслін сям. казяльцовых. Больш за 20 відаў, пашыраных у стэпавых і лесастэпавых зонах Еўразіі і Паўн. Афрыкі. На Беларусі ў Цэнтр. бат. садзе АН Беларусі ў 1960-я г. як

Адокса мускусная.

дэкар. расліны інтрадукаваны 2 віды: А. вясновы, або гарыцвет (A. vernalis), і А. палымяны (A. flammea).

Сцябло прамое або слабагалінастае выш. ад 5 да 40 (эрэдку да 70) см. Лісце рассечана на вузкія сегменты. Кветкі буйныя, адзіночныя, залаціста-жоўтыя або чырвоныя. Плады — авальныя шматарэшкі з прамым або кручкападобным носікам. Выкарыстоўваюць для групавых пасадак і бардзюраў. Прэпараты з А. вясновага ўжываюцца пры сардэчнай недастатковасці, неўрозах.

**АДО́РАНАСЦЬ**, індывідуальная своеасаблівасць задаткаў чалавека, якая забяспечвае патэнцыяльныя магчымасці і дазваляе дасягнуць значных поспехаў у пэўнай галіне дзейнасці. Залежыць ад біялагічна вызначаных прычын (уласцівасцяў мозга, нервовай сістэмы і інш.). Высокая ступень спецыяльнай А. — *талент*. Тэрмінам «агульная адоранасць» вызначаюць А. інтэлектуальную — праяўленне здольнасцей у рознай сферы дзейнасці. Звычайна А. праяўляецца на ранніх этапах узроставага развіцця, у т.л. і праз якасці характару, асаблівасці сну, актыўнасці. Рэалізацыя А. залежыць: ад адпаведных абставін жыцця, спец. навучання і выхавання; запатрабавання з боку грамадства; самарэалізацыі (самавыхавання) асобы.

*Літ.:* Лейтес Е.С. Способности и одарённость в детские годы. М., 1984; Одарённые дети: Пер. с англ. М., 1991; Леви В. Нестандартный ребёнок. 3 изд. Хабаровск, 1990.

*Т.У.Васілец.*

**АДО́РНА** (Adorno) Тэадор (11.9.1903, г. Франкфурт-на-Майне — 6.8.1969), нямецкі філосаф, сацыёлаг, музыказнавец. Прадстаўнік *франкфурцкай школы*. Пасля 1933 у эміграцыі (Англія, ЗША). З 1949 у Франкфурце-на-Майне: праф. ун-та, з 1953 кіраўнік Ін-та сац. даследаванняў. Погляды А. склаліся на перакрыжаванні ням. *неагегельянства* і авангардысцкай крытыкі культуры. Паводле яго філасофіі эвалюцыя чалавецтва — гэта гісторыя «няўдалай цывілізацыі», гісторыя «індывідуалізацыі» чалавека, тоеснай пастаяннаму паглыбленню яго «адчужэння». У духу гэтых ідэй А. рабіў сац.-філас. аналіз музыкі. Асн. працы: «Дыялектыка асветы» (1947, з М.Хоркхаймерам), «Філасофія новай музыкі» (1949), «Аўтарытарная асоба» (1950, у сааўт.), «Прызмы. Крытыка культуры і грамадства» (1955), «Негатыўная дыялектыка» (1966) і інш.

**АДПАВЕ́ДНАСЦІ ПРЫ́НЦЫП**, агульнаметадалагічны прынцып развіцця навукі, які патрабуе, каб кожная новая тэорыя, што прэтэндуе на больш глыбокае апісанне аб'ектыўнай рэальнасці на больш шырокую вобласць прымянення, чым старая, уключала апошнюю як свой асобны гранічны выпадак. Адлюстроўвае дыялектыку працэсу пазнання, пераходу ад менш поўнай да больш поўнай ісціны і пры гэтым змена адной прыродазнаўча-навук. тэорыі другой выяўляе не толькі розніцу, але і сувязь, пераемнасць паміж імі, якая можа быць выражана з матэм. дакладнасцю. А.п.

Да арт. Адоніс. Венера і Адоніс. Маст. П.П.Рубенс. Каля 1614.

сфармуляваны Н.*Борам* пры стварэнні першапачатковай квантавай тэорыі атама і яго спектраў (1913). Паводле А.п. фіз. вынікі квантавай механікі ў гранічным выпадку вял. квантавых лікаў супадаюць з вынікамі класічнай тэорыі; квантава-мех. апісанне фіз. аб'ектаў павінна пераходзіць у класічнае пры $h \to 0$ ($h$ — Планка пастаянная); хвалевая оптыка — у геам. пры $\lambda \to 0$, дзе $\lambda$ — даўжыня хвалі; законы рэлятывісцкай механікі — у законы класічнай пры скарасцях руху $v << c$, дзе $c$ — скорасць святла ў вакууме.

*Л.М.Тамільчык.*

**АДПА́Л**, 1) тэрмічная апрацоўка металаў і сплаваў, якая ўключае награванне металаў ці сплаваў да пэўнай т-ры, вытрымку, павольнае (бесперапыннае ці ступеньчатае) ахаладжэнне і паляпшае іх якасць пры далейшай апрацоўцы і эксплуатацыі. Пры А. адбываюцца працэсы *адпачыну металу, гомагенізацыі, рэкрышталізацыі, рэлаксацыі, перакрышталізацыі, графітызацыі, сфераідызацыі*, якія прыводзяць да паляпшэння структуры, аднароднасці, фіз.-мех. і эл.-магн. уласцівасцяў, зняцця ўнутраных напружанняў, прыдання мяккасці і пластычнасці металам і сплавам. А. павялічвае вязкасць матэрыялаў. 2) Тэрмічная апрацоўка шкла пры t 400—600 °С у спец. печах для зняцця ўнутраных напружанняў (гл. ў арт. *Шкло*).

**АДПАЧЫ́Н МЕТА́ЛАЎ**, працэс часткавага аднаўлення структуры і фіз.-хім. уласцівасцяў дэфармаваных ці радыяцыйна апрамененых металаў і сплаваў. Адбываецца пры награванні да т-ры *рэкрышталізацыі* без змены мікраструктуры. Жалезныя вырабы награваюць да t 250—300 °С, легкаплаўкія металы і сплавы (напр., свінец) вытрымліваюць пры пакаёвай т-ры. А.м. ліквідуе скажэнні крышталічнай рашоткі, суправаджаецца зніжэннем эл. супраціўлення, скорасці растварэння ў кіслотах і межаў цякучасці металаў і сплаваў. Выкарыстоўваецца для павышэння пластычнасці канструкцыйных матэрыялаў без паніжэння іх трываласці.

**АДПУ́ЖВАЛЬНЫЯ РЭ́ЧЫВЫ**, гл. *Рэпеленты*.

**АДРАБО́ТКІ**, форма найму сялян са сваімі прыладамі працы і цяглом да памешчыка або заможнага селяніна за арандаваную зямлю, пазычаныя грошы, хлеб, лясныя матэрыялы, у пагашэнне штрафаў і інш. У Рас. імперыі, у т.л. на Беларусі, шырока практыкаваліся пасля *сялянскай рэформы 1861*. Сталі асновай адработачнай сістэмы ў памешчыцкай гаспадарцы (вынік малазямелля, падатковага ўціску, пазаэканам. прымусу сялян). Разнавіднасцямі А. былі здольшчына і «кругавая» (поўная) апрацоўка панскай зямлі або выкананне асобных відаў работ (ворыва, пасеву, уборкі) з аплатай часткова грашыма, часткова зямельнымі ўгоддзямі. Па меры росту таварнай гаспадаркі і асаблівa разлажэння сялянства А. паступова выцясняліся капіталіст. наймам, але былі вельмі пашыраны на Беларусі і ў пач. 20 ст.

*В.П.Панюціч.*

**«АДРАВО́НЖ»**, прыватнаўласніцкі герб, якім карысталіся каля 60 родаў на Беларусі, Украіне, у Літве і Польшчы (Адравонжы, Аўтусціновічы, Высагерды, Кушалі, Капусты, Храптовічы, Шыдлавецкія і інш.). На чырвоным полі сярэбраная страла наканечнікам уверх і 2 вусамі ўніз; клейнод — на прылбіцы паўлінавыя пёры, на іх фоне такая ж страла ўбок. У Польшчы вядомы з 14 ст., у ВКЛ з 1413.

**АДРАДЖЭ́ННЕ**, Рэнесанс, эпоха станаўлення ў Еўропе духоўнай культуры Новага часу (14—1-я пал. 17 ст.). Абумоўлена прагрэс. змены ў эканам. і сац.-паліт. жыцці еўрап. краін: развіццё гарадоў, зараджэнне элементаў бурж. адносін і таварна-грашовай гаспадаркі, фарміраванне нац. дзяржаў і абсалютных манархій, актывізацыю антыфеад. рухаў і рэліг. барацьбы, секулярызацыю духоўнага жыцця грамадства. У паняцце «А.» ўключаюць таксама грамадска-культ. рух у еўрапейскіх, у т.л. славянскіх, народаў, знітаваных агульным духоўна-культ. уздымам, вызв. барацьбой, абуджэннем нац. свядомасці і станаўленнем дзяржаўнасці (каралінгскае А., балгарскае А. і інш.). М.Багдановіч, аўтар паняцця «беларускае А.», уключаў у гэты працэс і нац.-культ. развіццё бел. народа ў 16 — пач. 20 ст. (гл. *Адраджэнне нацыянальнае*). Характэрная асаблівасць А. — зварот да культуры антычнасці як зыходнага пункта для фарміравання новай, пераважна свецкай, еўрап. культуры, апорай якой стаўніліся гарады, двары і маёнткі феадалаў, багатых мяшчан, а выразнікамі — прадстаўнікі новай інтэлігенцыі, перадавыя грамадскія і паліт. дзеячы і інш. У іх асяроддзі фарміраваўся рэнесансава-гуманіст. светапогляд, аснову якога складалі тры вядучыя прынцыпы: вучэнне пра абсалютную свабоду (неабмежаваныя магчымасці чалавека ў яго адносінах да свету, самога сябе, пазнання і творчасці); уяўленне пра самакаштоўнасць чалавечага жыцця, або рэнесансавы *антрапацэнтрызм*; натуралізм як пераважны спосаб інтэрпрэтацыі прыродна-сац. рэчаіснасці і чалавека. У культуры і светапоглядзе рэнесансавых гуманістаў побач з раннебурж., саслоўна-класавымі сцвярджаліся вечныя, агульначалавечыя каштоўнасці; свецкія элементы цесна перапляталіся з рэліг., хрысціянскія — з язычніцкімі, натура-

Адоніс: 1 — вясновы; 2 — летні.

Герб «Адравонж».

лістычныя і навук. — з містычнымі і астралагічнымі, ідэі «агульнага дабра» — з гранічным індывідуалізмам і амаралізмам; вучэнне пра высокую годнасць чалавека — з усведамленнем яго бяссілля ў існуючых грамадскіх умовах. Эпоха А. адметная вял. геагр. адкрыццямі, буйнымі дасягненнямі ў развіцці тэхнікі, навукі і мастацтва, узнікненнем кнігадрукавання.

У розных краінах А. не супадала храналагічна і тыпалагічна. У адрозненне ад класічнага італьян. А., рэнесансавую культуру ў некаторых краінах Зах. і Цэнтр. Еўропы (Германія, Скандынаўскія краіны, Англія і г.д.) называюць Паўночным А., асаблівасці якога: кампраміс з сярэдневяковымі традыцыямі, сувязь з рэліг. і нац.-культ. рухамі, *Рэфармацыяй* і інш. Да такога тыпу належыць і ўсходнееўрап. А. (Беларусь, Украіна, Літва), дзе інтэнсіўна развіваліся нац. самасвядомасць, навука і культура, значных поспехаў дасягнулі л-ра і мастацтва.

**Навука і тэхніка**. Адной з адметных рысаў эпохі А. было ўзнікненне навук. прыродазнаўства. Гэтаму спрыялі практычныя патрэбы грамадства (гандаль, мараплаванне, буд-ва, ваен. справа), а таксама ўзнікненне новага, антыдагматычнага светапогляду.

Найб. значныя адкрыцці ў астраноміі, геаграфіі, тэхніцы, *Вялікія геаграфічныя адкрыцці* (Х.Калумба, Васка да Гамы і інш.) пацвердзілі шарападобнасць Зямлі і стымулявалі станаўленне геалогіі, батанікі, заалогіі і этнаграфіі. Адкрыццё М.Капернікам *геліяцэнтрычнай сістэмы свету* дало новы імпульс развіццю дакладнага прыродазнаўства, што прывяло да стварэння ў канцы 17 ст. механікі І.Ньютана. Італьян. вучоны А.Везалій працай «Пра будову чалавечага цела» (1543) заклаў асновы анатоміі. Іісп. вучоны М.Сервет блізка падышоў да адкрыцця кругавароту крыві ў арганізме. Хім. даследаванні ўласцівасцяў розных мінералаў (Ф.Парацэльс і інш.) далі пачатак навук. фармакалогіі, садзейнічалі ўзнікненню клінічнай медыцыны і новых метадаў лячэння хваробаў. У выніку адкрыццяў у матэматыцы, механіцы і астраноміі знойдзены спосабы рашэння агульных ураўненняў 3-й і 4-й ступеняў (італьян. матэматыкі Дж.Кардана, Н.Тарталья, Л.Ферары), распрацавана сучасная літарная сімволіка (франц. матэматык Ф.Віет), уведзены дзесятковыя дробы і адкрыты закон раўнавагі сіл на нахільнай плоскасці (галандскі вучоны С.Стэвін). Эксперыментальна вывучаліся законы падзення целаў (Г.Галілей), руху планет (І.Кеплер), ствараліся тэорыя простых механізмаў. Леанарда да Вінчы сканструяваў ткацкі станок, прадзільную і землечарпальную машыны, прапанаваў праекты лятальнага апарата, парашута і вял. гідратэхн. збудаванняў. Дасягненні матэматыкі і механікі спрыялі развіццю буд. справы, архітэктуры і караблебудавання. Выраблялася машыны і механізмы для падымання грузаў і інш. работ, гідраўлічныя рухавікі, такарныя станкі, агнястрэльная зброя, удасканальваліся працэсы выплаўкі металаў і шліфавання шкла. Вынаходства падзорнай трубы і мікраскопа ўзбагаціла эксперым. метады даследаванняў. Усё гэта спрыяла аб'ектыўнаму пазнанню рэчаіснасці, развіццю філас. думкі, пашырэнню асветы і адукацыі.

**Філасофія** А. процістаяла схаластыцы, хоць і не парывала з сярэдневяковай традыцыяй. Вылучаліся яе этыка-гуманіст., неаплатанічная і натурфілас. лініі. Першая (Калуча Салютацы, Леанарда Бруні, Ларэнца Вала, Піка дэла Мірандала, Эразм Ратэрдамскі, Ф.Скарына, М.Мантэнь) вылучалася цікавасцю да чалавека, яго прызначэння, унутр. свету, магчымасцяў і свабоды, выкарыстаннем сац.-этычных ідэй памяркоўнага стаіцызму (у духу «грамадзянскага гуманізму») і эпікурэізму (у духу раннебурж. індывідуалізму). Для прадстаўнікоў Паўночнага А. характэрна спроба гуманіст. перапрацоўкі хрысц. этыкі (Эразм Ратэрдамскі, Скарына і інш.). Неаплатанічная лінія А. (М.Кузанскі, Марсіліо Фічына) знітавана з пастаноўкай радыкальных анталагічных праблем, стварэннем пантэістычнай карціны свету, распрацоўкай дыялектычных ідэй. Прадстаўнікі натурфілас. лініі (Ф.Парацэльс, Дж.Кардана, Б.Тэлезіо, А.Доні, Ф.Патрыцы, Дж.Бруна, Т.Кампанела) разглядалі свет і чалавека, зыходзячы пераважна з «уласных пачаткаў», абапіраючыся на вопыт, навук. дасягненні, гіст. практыку і нар. мудрасць. Найб. значны вынік філасофіі А. — натураліст. пантэізм (Бруна), і яго аналаг — містычны пантэізм (Т.Мюнцэр, Я.Бёме). У эпоху А. ўзнікла і новае прыродазнаўства (Леанарда да Вінчы, М.Капернік). Геліяцэнтрычнае вучэнне абумовіла радыкальны перагляд філас. уяўленняў пра сусвет. На яго падставе Бруна распрацаваў касмалагічнае вучэнне пра бясконцасць Сусвету. У той жа час рабілася намаганне аднавіць аўтэнтычнае вучэнне Арыстоцеля, скажонае схаластыкай і натуралістычнай інтэрпрэтацыяй арыстоцелізму (П.Пампанацы). Узнікла сац. утопія (Т.Мор, Кампанела), развівалася новая паліт. думка (Н.Макіявелі, Ж.Бадэн, А.Маджэўскі, А.Волан), у якой гісторыя трактавалася як вынік мэтанакіраванай дзейнасці людзей, дзярж. палітыка аддзялялася ад рэлігіі і маралі (Макіявелі) або шчыльна звязвалася з імі (Ж.Каль-

Да арт. **Адраджэнне**. С.Батычэлі. Вясна. Каля 1477—78.

він, Волан). Сац.-паліт. філасофія А. зыходзіла з пераканнанняў неабходнасці ўдасканальваць існуючае грамадства, дзяржаву, царкву, норавы. Рэнесансавыя ідэі адлюстраваліся ў рэфармац. вучэннях, у якіх сцвярджалася суверэннасць індывід. рэліг.-маральнай свядомасці чалавека (М.Лютэр, Скарына).

На Беларусі ў 15 — 1-й пал. 17 ст. ўжо існавалі пэўныя перадумовы для развіцця культуры А.: эканам. і сац.-паліт. ўзмацненне гарадоў, актывізацыя прагрэс. рэфармісцкага руху (агр., адм., суд., ваен. рэформы 1550—80-х г.), у выніку якіх адбывалася паліт. цэнтралізацыя і дзярж.-прававая стабілізацыя бел.-літоўскага грамадства. Сведчаннем А. на Беларусі было фарміраванне бел. народнасці і рост яе самасвядомасці, пашырэнне міжнар. культ. сувязяў, гуманіст. і рэфармацыйны рух. Секулярызацыя духоўнага жыцця тут выявілася ў развіцці адукацыі, кнігадрукавання, прытоку разнастайнай кніжнай прадукцыі з-за мяжы і камплектаванні айч. бібліятэк, мецэнацтва і ўзнікнення гуманіст. цэнтраў пры дварах буйных феадалаў (Слуцкіх, Радзівілаў, Хадкевічаў, Кішкаў, Глябовічаў і інш.), захапленні ант. культурай, станаўленні бел. л-ры і літ. мовы, развіцці гістарыяграфіі, філас. і грамадска-паліт. думкі, прававой тэорыі і практыкі, выяўл. мастацтва, архітэктуры, музыкі. На Беларусі А. адбывалася ў спецыфічных умовах узаемадзеяння ўсх. і зах. рэліг.-царк. і духоўна-культ. тэндэнцый, станаўлення бел. культуры ў складзе поліэтн. і рознарэліг. дзярж. ўтварэння (ВКЛ, Рэчы Паспалітай), незавершанасці працэсаў нац. і дзярж. дыферэнцыяцыі бел., укр. і літ. народаў. Характэрнымі рысамі айч. А. была наяўнасць у ВКЛ адноснай рэліг. талерантнасці, узаемадзеянне і ўзаемапранікненне бел., укр., літ., польскай і рус. культур, развіццё і функцыянаванне рэнесансавай культуры ва ўмовах каталіцкай экспансіі і *Контррэфармацыі*. Рэнесансавы гуманізм тут часцей выяўляўся як «хрысціянскі гуманізм»: захоўваліся асн. прынцыпы хрысціянства і рэвізаваліся некаторыя яго традыцыйна-сярэдневяковыя ўяўленні і паняцці: фарміраваўся бел. менталітэт — спецыфічны спосаб светаўспрымання і светаадчування, які вызначаў нац. характар і своеасаблівасць духоўнай культуры Беларусі; развівалася айч. філас. і грамадска-паліт. думка, л-ра, архітэктура, выяўл. мастацтва, музыка, тэатр.

У развіцці айч. грамадскай думкі эпохі А. вылучаюць 3 перыяды: 1-ы (пач. 16 ст. — 1550-я г.; ад Скарыны да Рэфармацыі) звязаны з пранікненнем у грамадскую свядомасць ідэі аднаўлення; 2-і (сярэдзіна — канец 16 ст.) — з сінтэзам рэфармацыйна-гуманіст. тэорыі і сац.-дзярж. практыкі; 3-і (канец 16 ст. — 1-я пал. 17 ст.) — з рацыяналізацыяй рэнесансава-гуманіст. думкі і выхадам яе на агульнаеўрап. арэну (*сацыніянства*), акумуляцый рэнесансавых ідэй дзеячамі грамадска-рэліг. барацьбы, якая разгарнулася пасля *Брэсцкай уніі 1596*, культурай айч. барока. У галіне анталогіі, гнасеалогіі і метадалогіі ідэі А. выяўляліся пераважна ў рэліг.-тэалагічнай форме (рацыяналізм С.Буднага і інш.). Існаваў і ўласна філас. спосаб фармулёўкі асн. уяўленняў (С.Лован, К.Лышчынскі), у якіх аналізаваліся пытанні сутнасці Бога, натуры Хрыста, паходжання свету (Брэсцкая біблія, «Хроніка» М.Стрыйкоўскага), разуменне цудаў, несмяротнасці душы, замагільнага жыцця, суадносін ідэальнага і матэрыяльнага, пазнання, веры і розуму, багаслоўя і філасофіі і інш. Вучэнне айч. мысліцеляў пра мараль было заснавана на прызнанні натуральнай прыроды чалавека, перакананні ў магчымасці яе ўдасканалення праз індывід. намаганні. Гуманізаваліся і набліжаліся да рэальнага жыцця ідэі хрысц. этыкі, адраджаліся філас.-этычныя вучэнні стоікаў, Цыцэрона, эпікурэйцаў, па-новаму інтэрпрэтавалася платонаўскае і арыстоцелеўскае вучэнне пра мараль. У рамках прабдемы чалавека, яго адносін да Бога, навакольнага асяроддзя, грамадства ўзнімаліся пытанні шчасця, сэнсу жыцця, агульнага і індывід. дабра, свабоды выбару, адказнасці, маральнага і інтэлектуальнага ўдасканалення, грамадз. абавязку і інш. (Скарына, М.Гусоўскі, М.Літвін, С.Кашуцкі, Волан, Якуб з Калінаўкі, М.Чаховіц, Сімяон Полацкі). Асн. праблема сац.-паліт. і прававой думкі айч. А. — удасканаленне грамадства і дзяржавы (Скарына, С.Будны, А.Валовіч, Л.Сапега, Волан). Геніяльным прадбачаннем Гусоўскага сталі ідэі экалагічнага выхавання чалавека. У працэсе станаўлення нац. самасвядомасці на 1-м этапе (16 ст.) пераважалі этнакульт. кампанент і секулярызаваная канцэпцыя нац. каштоўнасцяў (Скарына, С.Будны, В.Цяпінскі); на 2-м этапе (канец 16 — 1-я пал. 17 ст.) нац. свядомасць выяўлялася пераважна ў працэсе рэліг.-канфесіянальнага самавызначэння (С.Зізаній, М.Сматрыцкі,

Да арт. **Адраджэнне. Мікеланджэла.** П'ета. 1498—1500.

Да арт. **Адраджэнне. Рафаэль.** Мадонна з шчыглянём. 1507.

Да арт. **Адраджэнне. Леанарда да Вінчы.** Мадонна ў скалах. Каля 1497—1511.

І.Пацей і інш.). Праблемы нац.-культ. суверынітэту бел. народа вырашаліся ў барацьбе за сцвярджэнне ў грамадстве і дзяржаве прынцыпу талерантнасці, верацярпімасці (С.Будны, Сапега, Сматрыцкі).

**Літаратура.** У адрозненне ад саслоўнай л-ры сяродневечча, якая стваралася на мясц. дыялектах або на латыні, у эпоху А. ўзніклі першыя нацыянальныя (паводле мовы і значэння) літаратуры.

Росквіт італьян. л-ры ў 14—16 ст. (лірыка Ф.Петраркі, навелы Дж.Бакачыо, этычныя і паліт. трактаты палемістаў ад Петраркі да Н.Макіявелі, паэмы Л.Арыёста і Т.Таса) вылучылі італьян. культуру як трэцюю (побач з дзвюма антычнымі) класічную для інш. краін. У Германіі і Нідэрландах л-ра А. развівалася паралельна з Рэфармацыяй і знайшла ўвасабленне ў публіцыстыцы і антыклерыкальнай сатыры («Карабель дурняў» С.Бранта, «Пахвала дурасці» Эразма Ратэрдамскага, «Пісьмы цёмных людзей» У. фон Гутэна). Рэнесансавая л-ра Францыі акрамя антычнай і італьян. культуры абапіралася і на нар. «гальскую» традыцыю вальнадумства (лірыка Ф.Віёна, К.Маро); яе вяршыня — раман Ф.Рабле «Гарганцюа і Пантагруэль», лірыка П.Рансара. Помнікам позняга А. (перыяду рэліг. войнаў 2-й пал. 16 ст.) сталі «Вопыты» М.Мантэня. Са слав. л-р А. найб. яскрава праявілася ў паўд.-славянскай (т.зв. далмацінска-дубровніцкае А.) і ў польскай. У Дубровніку і інш. вольных гарадах з канца 15 ст. развівалася далмацінская л-ра, блізкая да суседняй італьянскай. У Польшчы А. звязана пераважна з узвышэннем шляхты ў 16 ст. і з Рэфармацыяй (абаронца шляхецкай дэмакратыі М.Рэй — аўтар першых твораў на польск. мове). У Англіі росквіт гуманіст. л-ры канца 16 ст. звязаны з творчасцю Ф.Сідні, Э.Спенсера, Дж.Лілі. Сусв. славу англ. А. прынёс тэатр канца 16 — пач. 17 ст. Цікавасць да «тытанічнай» асобы, паэтызацыя нац. мінулага, народнасць ідэй, вольная форма драмы характэрныя драматургіі У.Шэкспіра. Фінальнай з'явай ісп. і ўсяго еўрап. А. стала творчасць М.Сервантэса, асабліва яго раман пра Дон Кіхота, заснаваны на трагікамічным канфлікце паміж гераічнай асобай і варожай яму сістэмай грамадскага жыцця.

Характэрная рыса літ. працэсу Беларусі эпохі А. — узаемадзеянне ўсх., візантыйска-праваслаўных і зах., лацінаталіцкіх традыцый, сяродневяковых і рэнесансавых тэндэнцый. Побач з царк.-рэліг. л-рай у 15—16 ст. усё

Да арт. **Адраджэнне.** П.Перуджына. Мадонна з дзіцем і святымі. 1496.

Да арт. **Адраджэнне.** Джарджоне. Навальніца. 1506—07.

больш выкарыстоўвалася жывая нар. мова, якая падрывала манаполію царк.-слав. мовы. З'явіліся бел. пераклады свецкіх твораў замежнай л-ры («Жыціе Аляксея, чалавека Божага», «Аповесць пра трох каралёў»), кніг Бібліі. Вял. ролю ў станаўленні нац. л-ры Беларусі адыграла свецкае дзелавое пісьменства на старабел. мове (матэрыялы велікакняжацкай і інш. канцылярый, дзярж. прывілеі, граматы, Статуты ВКЛ і інш.), новыя бел. летапісы (*«Беларуска-літоўскі летапіс 1446»*, *«Хроніка Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага»*, *«Хроніка Быхаўца»* і інш.), якія адначасова былі і гіст. аповесцямі. Высокімі літ.-маст. якасцямі вызначаліся «Хроніка польская, літоўская, жамойцкая і ўсяе Русі» М.Стрыйкоўскага, *Баркулабаўскі летапіс*. Здабыткам бел. л-ры эпохі А. стала творчая спадчына паэтаў-лаціністаў пач. 16 ст. М.Гусоўскага («Песня пра зубра») і Я.Вісліцкага («Пруская вайна»). Важным этапам у развіцці айч. л-ры эпохі А. была дзейнасць Ф.Скарыны, заснавальніка ўсходнеслав. кнігадрукавання. Яго прадмовы і пасляслоўі да біблейскіх кніг — высокамаст. і арыгінальныя творы бел. л-ры пач. 16 ст. Яны сведчаць пра талент Скарыны як пісьменніка, паэта, гімнографа, рытара, мастака. На працягу 15 — пач. 17 ст. ў ВКЛ утварыўся шэраг культ.-асв. цэнтраў з буйнымі сховішчамі рукапісных і друкаваных кніг, скрыпторыямі, друкарнямі, школамі (Заблудаў, Брэст, Нясвіж, Заслаўе, Лоск, Вільня, Полацк, Слуцк, Любча і інш.), дзе працавалі кнігавыдаўцы, перакладчыкі, паэты, публіцысты. Тут выдаваліся тэалагічныя і літургічныя творы розных канфесій, гіст., філас., паліт. трактаты, творы ант. пісьменнікаў, падручнікі па граматыцы, рыторыцы, паэтыцы. Рэфармацыйна-гуманіст. рух, рэліг.-грамадская барацьба 16 — 1-й пал. 17 ст. спрыялі дзейнасці многіх таленавітых літаратараў, якія пісалі на бел., польск., лац. мовах (С.Будны, В.Цяпінскі, С.Кашуцкі, А.Волан, Л.Сапега, С. і Л.Зізаніі, І.Пацей, Л.Карповіч, М.Сматрыцкі, Я.Пашкевіч, І.Руцкі, Афанасій Філіповіч, Б.Будны, А.Рымша, Я.Радван, С.Грахоўскі, Я.Казаковіч, Л.Мамоніч, Г.Пельгжымоўскі, Ф.Іяўлевіч, Я.Пратасевіч, М.Сарбеўскі, Сімяон Полацкі і інш.). Росквіту дасягнула публіцыстыка — палемічная л-ра розных жанраў: ліст (пасланне), адказ (водпаведзь), слова (казанне), лямант (плач), прадмова. У паэзіі дамінаваў жанр *эпіграмы*, якой надавалася актуальнае маральнае і грамадскае гучанне, а таксама вершаваныя звароты да чытача, эпітафіі і інш. З'явіліся вершаваныя паэмы Рымшы «Дзесяцігадовая аповесць пра ваенныя справы... Крыштофа Радзівіла», Пельгрымоўскага «Пасольства да вялікага князя маскоўскага», Іяўлевіча «Лабірынт, або Заблытаная дарога», парадыйна-сатыр. творы, напісаныя сакавітай нар. мовай («Прамова Мялешкі»). Цікавасць да прыватнага жыцця чала-

века абумовіла развіццё мемуарнай л-ры (Ф.Еўлашоўскі, Ф.Кміта-Чарнабыльскі, А.Каменскі-Длужык, Я.Цадроўскі і інш.). Разам са школьным тэатрам узнікла драма (Сімяон Полацкі). Зараджалася тэорыя вершаскладання (Л.Зізаній, Сматрыцкі). Помнікамі айч. прозы сталі трактаты па паэтыцы, рыторыцы, тэорыі л-ры выкладчыкаў бел. калегіумаў, віленскай акадэміі («Пра дасканалую паэзію» Сарбеўскага, «Практычнае красамоўства» С.Лаўксміна і інш.).

**Выяўленчае мастацтва і архітэктура.** Народжанае адмаўленнем сярэдневяковай умоўнасці і сімволікі, мастацтва А. несла ідэі гуманізму, узвышала чалавека-мысліцеля. У цэнтры яго — гарманічна развіты чалавек.

У перыяд ранняга А. (15 ст.) мастацтва Італіі развівалася ў рамках Фларэнційскай, Умбрыйскай, Падуанскай і Венецыянскай школ жывапісу. Мастакі гэтых школ у сваёй творчасці спалучалі ідэі ант. гуманізму і рэалізму, заснаваныя на вывучэнні натуры, уяўленні пра фіз. харство і духоўную веліч чалавека. Яны ўзбагацілі мастацтва дакладным веданнем будовы чалавечага цела, перадачай перспектывы, ракурсаў, святлаценяў і г.д. Гэта найб. яскрава выявілася ў разнастайнай па характары творчасці жывапісцаў Мазачыо, Д.Гірландайо, А.Мантэнья, П'ера дэла Франчэска, С.Батычэлі, Анджэліка, П.Перуджына, сем'яў Беліні, Ліпі, скульптараў Л.Гіберці, Данатэла, Якопа дэла Кверча, Лука дэла Робія, А.Верок'ё. Апрача станковага жывапісу шырока развівалася мастацтва фрэскі. Рэалізм высокага А. (канец 15 — 1-я чвэрць 16 ст.) дасягнуў класічнай яснасці, манументальнасці вобразаў і абагульнення (Леанарда да Вінчы, Рафаэль, Мікеланджэла, А.Карэджа, Тыцыян, Джарджоне, П.Веранезе, Я.Тынтарэта, Джуліо Рамана і інш.). У перыяд феад. рэакцыі і Контррэфармацыі (з пач. 16 ст.) у Італіі ўзнікла мастацтва *маньерызму*, якое вызначалася суб'ектывізмам, манернасцю, вытанчанасцю формы (Я.Панторма, А.Бранзіна, Ф.Парміджаніна, Б.Чэліні). У дэкар. мастацтве створаны ўзоры тканін, эмаляў, шкла, маёлікі, вырабаў з металу, кашт. камянёў і інш. З 15 ст. развіваецца мастацтва залочанай разьбы, «чартазіянская мазаіка». На новай аснове фарміравалася і архітэктура. Распрацоўваліся і ажыццяўляліся прынцыпы рэгулярнай забудовы гарадоў, у якіх акрамя культавых збудаванняў ствараліся характэрныя для італьян. А. манум. палацца, вілы, шпіталі, фантаны і інш. Ант. ордэрная сістэма ўзбагаціла тэктоніку будынкаў, унесла ў дойлідства лагічную суразмернасць і гарманічную яснасць (Ф.Брунелескі, Л.Б.Альберці і інш.). На пач. 16 ст. ў Рыме пачаў складвацца агульна-італьян. арх. стыль (Д.Брамантэ, Дж. да Віньёла, Дж.Вазары). У Венецыі працавалі арх. М.Санмікелі, Я.Сансавіна, А.Паладыо. У Нідэрландах мастацтва А. супала з росквітам позняй готыкі, узнікла грамадз. архітэктура. З сярэдзіны 16 ст. тут фарміраваўся арх. стыль, які арыентаваўся на ант. і італьян. дойлідства эпохі А. У жывапісе развіваецца пераважна партрэт і пейзаж, асаблівая ўвага звяртаецца на перадачу навакольнага асяроддзя (Рагір ван дэр Вейдэн, Хуга ван дэр Гус, Г.Мемлінг, Лука Лейдэнскі, Х.Босх, К.Масейс). Ян ван Эйк залажыў асновы, на якіх пасля развівалася нідэрл. мастацтва. У Германіі мастацтва А. высокага росквіту дасягнула ў канцы 15 — пач. 16 ст., асабліва ў жывапісе і гравюры (А.Дзюрэр, А.Альтдорфер, Г.Гольбейн Малодшы і інш.). У франц. мастацтве А. адметна творчасць мастакоў Ж.Фуке, Клуэ, скульптараў Ж.Гужона, Ж.Пілона; для архітэктуры каралеўскіх і дваранскіх замкаў характэрны вытанчаны стыль (замак Шамбор). Своеасаблівыя рысы набыло мастацтва Іспаніі, Чэхіі, Славакіі, Польшчы, Венгрыі.

Пад уплывам рэнесансавай культуры Зах. Еўропы ў выяўл. мастацтве Беларусі 16 — сярэдзіны 17 ст. склаліся асяродкі гуманіст. культуры (двары Жыгімонта Аўгуста ў Вільні, Радзівілаў у Нясвіжы, Алелькавічаў у Слуцку), развіваліся новыя віды і жанры мастацтва. У жывапісе пашыраўся партрэт, у якім праявілася рэнесансавае разуменне асобы чалавека. На аснове сінтэзу зах.-еўрап. формаў і візант. маст. спадчыны ўзнік нац. варыянт параднага партрэта (партрэт Міхаіла Барысавіча). Пэўны час ён існаваў побач з рэпрэзентатыўным (партрэт Ю.Радзівіла) і надзеленым рысамі псіхалагізму паўфігурным (партрэт К.Слуцкай-Радзівіл). Складваўся жанравы і батальны жывапіс (А.Вейдэ). Рэлігійнае мастацтва развівалася ў некалькіх кірунках. Алтарная карціна вызначалася пластычнасцю формаў, яркасцю палітры, элементамі лінейнай перспектывы, атрыбутамі гіст. моды («Пакланенне вешчуноў», пасля 1514). У іканапісе з яго поствізантыйскай традыцыяй з'явілася наватарская плынь: у сюжэтную канву ўводзіліся быт. і этнагр. дэталі, арх. краявіды («Тройца» з Дастоева, «Нараджэнне Марыі» з Маларыцкага р-на), узбагачаўся эмац. каларыт, арнаментыка фонаў («Параскева Пятніца», Слуцкі р-н; «Лука і Сымон», Лунінецкі р-н). Высокага ўзроўню дасягнула паліхромная драўляная скульптура і разьба алтароў (Іакім і Ганна, Жабінкаўскі р-н; Праабражэнскі касцёл у в. Новая Мыш, Баранавіцкі р-н). Пашыралася партрэтная пластыка надмагілляў (А.Гаштольда ў Вільні, М.К.Радзівіла ў Нясвіжы). Складалася медальерная школа (Я.Энгельгарт і інш.). Дасягнуў росквіту дрэварыт, з канца 16 ст. — медзярыт. Дасканаласцю выканання вылучаліся тытульныя лісты, застаўкі, ініцыялы, канцоўкі і ілюстрацыі ў выданнях Ф.Скарыны (Біблія, 1517—19), у Брэсцкай бібліі (1563), Статуце ВКЛ 1588. Узніклі графічныя партрэты (Скарыны, Жыгімонта III, М.Р.Радзівіла, В.Цяпінскага), геральдычныя кампазіцыі. Т.Макоўскі і інш. выконвалі арх. пейзажы, карты, ілюстрацыі да навук. трактатаў. З 16 — 1-й пал. 17 ст. дайшлі творы жывапісу, у якіх адлюстраваны тыповыя рысы еўрап. А., асабліва ў пашыраным на бел. землях парадным (сармацкім) партрэце (Грызельда Сапега, Юрыя Радзівіла, Софіі Алелькаўны Радзівіл і інш.). У дэкар.-прыкладным мастацтве стылістыка А. выявілася ў арнаментацыі абкладаў абразоў (Будслаўская шата), царк. начынні і параднай зброі эмалямі, кашт. камянямі, літымі і чаканенымі накладкамі. З'явілася кафля з сюжэтнымі, гербавымі выявамі.

Да арт. **Адраджэнне.** Сабор Санта-Марыя дэль Ф'ёрэ ў Фларэнцыі. Купал арх. Ф.Брунелескі. 1420—36.

Да арт. **Адраджэнне.** Палац Дукале ва Урбіна (Італія). Унутраны двор. Каля 1470—1653.

Да арт. **Адраджэнне.** Замак Шамбор у Францыі. Арх. Ж. і Д.Сурдо, П.Нево і інш. 1519—40.

вымі і партрэтнымі выявамі (Лагойск, Заслаўе), з каляровым глазураваным пакрыццём. З заснаваннем мануфактур (15 ст.) пашыраўся асартымент вырабаў са шкла. У бел. мастацтве 1-й пал. 17 ст. формы А. працягвалі суіснаваць з рысамі маньерызму, але ўсё больш саступалі месца стылістыцы барока.

У архітэктуры і горадабудаўніцтве Беларусі з эпохай А. звязаны спробы комплекснай рэканструкцыі гарадоў на аснове рэгулярнага плана, які формамі набліжаўся да прамавугольніка, авала, паўавала (Нясвіж, Быхаў, Слуцк). Цэнтрам яго кампазіцыі звычайна была плошча з ратушай і храмамі. Будаваліся таксама палацы, шпіталі, дамы цэхавых брацтваў і інш. Напачатку рысы рэнесансу спалучаліся з элементамі готыкі, але гатычныя формы збудаванняў пач. 17 ст. набывалі пластычны дэкор (*Мірскі замак, Сынковіцкая царква-крэпасць, Мураванкаўская царква-крэпасць*). Свецкая і культавая архітэктура паступова траціла суровыя абарончыя рысы: палацы афармляліся аркаднымі галерэямі (палац у Рагачове), з'явіліся храмы на ўзор ратонды з купалам (*Смаргонскі кальвінскі збор*), вежы некаторых храмаў аздабляліся дэкар. элементамі (*Заслаўская Спаса-Праабражэнская царква*). Інтэр'ер узбагачаўся разнымі алтарамі, скляпенні — ляпнымі нервюрамі, якія ўтваралі дэкар. ўзор (*Чарнаўчыцкі Троіцкі касцёл, Вішнеўскі касцёл Марыі*).

**Тэатр.** У еўрап. т-ры 2-й пал. 15—16 ст. адбываўся паступовы пераход ад аматарскіх тэатр. формаў, звязаных з патрэбамі каталіцкай царквы, да пра-

Да арт. **Адраджэнне. Г.Гольбейн Малодшы.** Партрэт Ш.Марэта. 1536.

Да арт. **Адраджэнне.** Апостал. Дрэва. Канец 16 ст. Нацыянальны мастацкі музей Беларусі.

Да арт. **Адраджэнне. А.Дзюрэр.** Чатыры коннікі. «Апакаліпсіс». Гравюра на дрэве. 1498.

фес. т-ра, які існаваў як самастойная эстэт. і эканам. сістэма і абапіраўся на здабыткі ант. тэатр. мастацтва і тэорыю драмы.

Першыя спробы аднаўлення тэатра на ант. ўзор (напачатку стараж.-рымскі) зрабілі італьян. гуманісты. З канца 15 ст. ў Рыме, Ферары, Фларэнцыі на лац., потым і на італьян. мове ставілі творы П.Тэрэнцыя, Ц.М.Плаўта, Л.А.Сенекі; на пач. 16 ст. — творы нац. драматургіі («Куфэрак» Л.Арыёста, «Каляндра» Б.Давіцы, «Мандрагора» Н.Макіявелі), якія былі першай формай арыгінальнага рэнесансавага т-ра — італьян. вучонай камедыяй. Потым у рэпертуары з'явіліся трагедыя і пастараль. Пры дварах арыстакратаў, дзе звычайна адбываліся тэатр. паказы, пачыналі ўзводзіць і першыя тэатр. будынкі, арыентаваныя на рэстаўрацыю рымскай традыцыі. Пад уплывам рэнесансавага жывапісу развіваліся перспектыўныя дэкарацыі. З канца 16 ст. фарміруецца прынцыпова новы тып сцэны — сцэна-скрыня, які развіўся ў тэатры *барока*. Ант. мастацтва паўплывала на традыцыйныя нар. тэатр. формы многіх краін Еўропы, найперш на т-р Італіі, дзе створана *камедыя дэль артэ*, якая, не маючы сваёй сталай драматургіі, абапіралася на стараж.-рымскія традыцыі імправізацыйнага т-ра масак. У Англіі і Іспаніі ўздым познарэнесансавага еўрап. т-ра звязаны з драматургіяй У.Шэкс-

пра, М.Сервантэса, Лопэ дэ Вэгі. Працэс стварэння нац. т-ра ў Францыі і на ням. землях іпоў запаволена. У эпоху А. (да пач. 17 ст.) склаліся асн. прынцыпы драматургіі, арганізацыі тэатр. прасторы, акцёрскага майстэрства, функцыянавання тэатр. труп, якія

Да арт. **Адраджэнне.** Фрагмент арната з Пінска. Канец 15—16 ст.

Да арт. **Адраджэнне.** Партрэт Грызельды Сапега. Невядомы мастак. 1630-я г. Нацыянальны мастацкі музей Беларусі.

надоўга вызначылі еўрап. тэатр. традыцыі і ў многім захаваліся да сучаснасці.

На Беларусі першыя еўрап. тэатр. формы (*літургічная драма, школьны тэатр*) з'явіліся ў 16 ст. праз дзейнасць каталіцкай царквы. Пазней, у эпоху барока, яны разам з прыдворным т-рам сталі важнымі кампанентамі бел. тэатр. культуры.

**Музыка.** У 14 — 1-й пал. 17 ст. ў муз.

Да арт. **Адраджэнне.** Партрэт Юрыя Радзівіла. Мастак невядомы. 1590-я г. Нацыянальны мастацкі музей.

мастацтве адбыліся істотныя змены.

З'явілася нотадрукаванне, павялічылася роля свецкіх жанраў (*шансон, мадрыгал*, мадрыгальная камедыя, у канцы 16 ст. — *опера, балет*), пашырылася аматарскае музіцыраванне, самастойнай стала інстр. музыка (харальныя апрацоўкі, *рычэркары, канцоны, прэлюдыі, такаты, фантазіі*); адрадзілася цікавасць да танц. мастацтва. У традыцыйных царк. жанрах *месе* і матэце побач з грыгарыянскімі сталі выкарыстоўваць свецкія мелодыі. З пашырэннем *храматызму*, фарміраваннем мажору і мінору, тарманічнай функцыянальнасці, устанаўленнем новай трохгучнай канцэпцыі вертыкалі зазнала істотныя змены тэхніка кампазіцыі. На аснове агульнастыліст. заканамернасцяў адбывалася актыўнае фарміраванне нац. школ — нідэрландскай (Г.Дзюфаі, І.Окегем, Я.Обрэхт, Жаскен Дэпрэ), італьян. (Палестрына, К.Джэзуальда ды Веноза, Л.Марэнцыо), франц. (К.Жанекен), ням. (Г.Фінк, Б.Рэзінарыус), англ. (Дж.Данстэйбл, У.Бёрд), іспан. (К. дэ Маралес, Т.Л. дэ Вікторыя), чэш. (Я.Т.Турноўскі, К.Гарант), польск. (Вацлаў з Шамотул, М.Гамулка). Тэорыю музыкі развівалі ў Італіі І.Тынкторыс, у Швейцарыі Гларэан, у Іспаніі Ф.Салінас і інш.

На Беларусі асн. асяродкамі муз. А.

Да арт. **Адраджэнне.** Тройца. Гравюра Ф.Скарыны з кнігі «Быццё». 1519.

з'яўляліся брацкія школы, каталіцкія калегіумы, дзе была добра пастаўлена муз. адукацыя, практыкаваліся шматгалосыя харавыя спевы па 5-лінейнай нотнай сістэме. Асн. узорам новага нотнага запісу стаў псалтыр Яна Гуса, які засведчыў з'яўленне нотадрукавання. Пратэстанцкія канцыяналы, выдадзеныя ў Брэсце (зб. «Песні хвал боскіх», 1558), Нясвіжы і Любчы, побач з духоўнымі творамі змяшчалі свецкія песні. Сярод муз. дзеячаў А. на Беларусі — Вацлаў з Шамотул, Ц.Базылік, В.Бакфарк. У гэты час зарадзілася самабытная культура бел. *канта*, што стала значнай з'явай у прафес. свецкім і царк. мастацтве.

*Літ.:* Культура эпохи Возрождения и Реформация. Л., 1981; Лосев А.Ф. Эстетика Возрождения. М., 1978; Баткин Л.М. Итальянские гуманисты: Стиль жизни и стиль мышления. М., 1978; Культурные связи народов Восточной Европы в XVI в.: Проблемы взаимоотношений Польши, России, Украины, Белоруссии и Литвы в эпоху Возрождения. М., 1976; Горфункель А.Х. Философия эпохи Возрождения. М., 1980; Падокшын С.А. Філасофская думка эпохі Адраджэння ў Беларусі: Ад Францыска Скарыны да Сімяона Полацкага. Мн., 1990; Конон В.М. От Ренессанса к классицизму: (Становление эстет. мысли Белоруссии в XVI—XVIII вв.). Мн., 1978; Сокол С.Ф. Политическая и правовая мысль в Белоруссии XVI — первой половины XVII в. Мн., 1984; Галенчанка Г.Я. Францыск Скарына — беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар. Мн., 1993; Голенищев-Кутузов И.Н. Итальянское Возрождение и славянские литературы XV—XVI веков. М., 1963; Саверчанка І.В. Старажытная паэзія Беларусі, XVI — першая палова XVII ст. Мн., 1992; Дорошкевич В.И. Новолатинская поэзия Белоруссии и Литвы: Первая половина XVI в. Мн., 1979; Чатырохсотлецце беларускага друку, 1525—1925. Мн., 1926; Помнікі старажытнай беларускай пісьменнасці. Мн., 1975; Шматаў В.Ф. Беларуская кніжная гравюра XVI—XVIII ст. Мн., 1984; Шрамкова Г. Искусство Возрождения: Италия, Нидерланды, Германия, Франция: [Альбом]. М., 1977; Бенеш О. Искусство Северного Возрождения: Пер. с англ. М., 1973; Шчакаціхін М. Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва. Мн., 1928; Гісторыя беларускага мастацтва. Т. 1. Мн., 1987; Чантурыя В.А. История архитектуры Белоруссии. 2 изд. Мн., 1977; Трусов О.А. Памятники монументального зодчества Белорусии XI—XVII вв. Мн., 1988; Ткачоў М.А. Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII—XVIII стст. Мн., 1978; Бернсон Б. Живописцы итальянского Возрождения: Пер. с англ. М., 1965; Костюковец Л.Ф. Кантовая культура в Белоруссии. М., 1975; Евдокимова Ю.К., Симакова Н.А. Музыка эпохи Возрождения. М., 1982.

*С.А.Падокшын* (агульная частка, філасофія, літаратура), *А.Ю.Хадыка* (выяўл. мастацтва і арх.), *В.М.Арэшка* (тэатр).

**«АДРАДЖЭ́ННЕ»**, бел. кааператыўна-выдавецкае т-ва. Існавала ў Мінску ў крас. — снеж. 1922. Засн. Акад. цэнтрам Наркамасветы БССР для выдання твораў маст. л-ры і падручнікаў для бел. школ. Выдала зб-кі вершаў «Дудка беларуская» і «Смык беларускі» Ф.Багушэвіча (у адной кнізе), «Спадчына» Я.Купалы, «Водгулле» Я.Коласа, «Пад

Да арт. **Адраджэнне.** Тэатральны паказ на плошчы ў Лувене (Бельгія). З гравюры 1594.

Да арт. **Адраджэнне.** Кальвінскі збор у г. Смаргонь Гродзенскай вобласці. 16 ст. (злева); Спаса-Праабражэнская царква ў г. Заслаўе. 2-я пал. 16 ст.

родным небам» З.Бядулі, паэму «Босыя на вогнішчы» М.Чарота, «Нарысы па гісторыі беларускай літаратуры. Старадаўні перыяд» М.Янчука, падручнікі, альманах «Адраджэнне» і інш. Мела кнігарню ў Мінску, вяло продаж бел. кніг у Маскве, Гомелі і інш. гарадах Беларусі. Рэарганізавана ў выд-ва «*Савецкая Беларусь*».

**АДРАДЖЭ́ННЕ НАЦЫЯНА́ЛЬНАЕ**, заканамернасць у гіст. развіцці асобных народаў, якая выяўляецца ў паскораным руху да больш высокага ўзроўню грамадскага быцця, культуры і нац. свядомасці пасля перыяду застою альбо ўпадку. А.н. неабходна адрозніваць ад

Да арт. **Адраджэнне**. Пацір. Канец 15 — пач. 16 ст. Нацыянальны мастацкі музей Беларусі (злева); заслаўская кафля. Сярэдзіна 16 ст.

Рэнесансу — еўрап. культ.-гіст. эпохі на сумежжы сярэднявечча і Новага часу (гл. *Адраджэнне*). Феномен гуманіст. Адраджэння характэрны для тых рэгіёнаў, гіст. працэсы ў якіх пазначаны адноснай стабільнасцю і паступальнасцю развіцця. А.н., наадварот, выяўляецца пераважна ў тых народаў Усх. Еўропы, у славянскім, азіяцкім і афрыканскім рэгіёнах, гіст. працэсы ў якіх характарызуюцца нераўнамернасцю і катастрафічнасцю. У полі зроку А.н. як заканамернай сусв.-гіст. з'явы, якая паўтараецца ў пэўным «гістарычным рытме», Рэнесанс бачыцца як яго этап, на якім адбываецца станаўленне нац. дзяржаў, нац. культур і моў.

Прыкметы раннехрысц. адраджэння (станаўленне дзяржавы і прававых інстытутаў, высокі ўзровень дойлідства, ужытковага і царк. выяўл. мастацтва, асветніцтва Ефрасінні Полацкай і Кірылы Тураўскага) з'явіліся на Беларусі ў 11—13 ст. у выніку творчага парыву маладога этнасу і ўплыву вытанчанай эліністычнай культуры Візантыі. Бел. грамадска-паліт. і творча-культ. ўзлёт у 16—1-й пал. 17 ст. (кнігадрукаванне і асветніцтва Ф.Скарыны, высокі ўзровень прававядомасці, зафіксаваны ў Статутах ВКЛ 1529, 1566, 1588, развіццё свецкай л-ры і мастацтва, дзяржаўнасць бел. мовы) абумоўлены бел. дзяржаўнасцю, культ. сувязямі з Зах. Еўропай, уплывам гуманіст. светапогляду. Ва ўмовах упадку (2-я пал. 17—18 ст.) і ліквідацыі (канец 18 — пач. 20 ст.) бел. дзяржаўнасці нац. культура развівалася, набывала новыя, свецкія формы (архітэктура, тэатр, лацінская і польскамоўная л-ра, асв. філасофія), аднак паступова была адсунута афіц. польскай і рус. культурамі на этнагр., часткова царк.-прыходскі ўзровень. Парадокс бел. гісторыі і культуры ў тым, што т.зв. «адсталасць» і «забітасць» карэнных беларусаў, пераважна сялянства, дазволілі захаваць генет. «ядро» самабытнай нар. культуры, якое пазней стала асновай А.н. Традыц. этн. культура і яе носьбіты былі выключаны са сфер афіц. функцыянавання і праз гэту сваю ізаляванасць пазбеглі дэнацыяналізацыі, растварэння ў афіц. польск. і рус. культурах. Пад прэс паланізацыі і русіфікацыі трапілі толькі «вяршкі» культуры, яе афіцыйная функцыян. частка — школа, друк, некаторыя прафес. віды і жанры мастацтва, сферы дзярж. кіравання — тое, з чаго фактычна была выключана асн. частка бел. народа.

Бел. А.н. пачалося ў 19 ст. і прайшло некалькі этапаў. Чарговыя хвалі ўздыму ў неспрыяльных умовах змяняліся спадам, што дазваляе гаварыць пра адносную самастойнасць кожнага з гэтых этапаў, бо яны адрозніваліся сваімі мэтамі і вынікамі, грамадскімі сіламі і духоўнымі імпульсамі, якія выклікалі адраджэнцкі рух. Першы этап пачаўся ў рэгіёне ўплыву Віленскага ун-та як літаратурнае асветніцтва ліберальна-рамант. кірунку: яго дзеячы, пісьменнікі і публіцысты на сумежжы польск. і бел. культур (Я.Чачот, Я.Баршчэўскі, Р.Падбярэскі, В.Дунін-Марцінкевіч і інш.) марылі пра аднаўленне гіст. пройдзенай рэальнасці — Рэчы Паспалітай на канфедэратыўных асновах. Пасля задушэння паўстання 1863—64, паліт. рэакцыі і застою ў апошняй чвэрці 19 ст. пачаўся другі этап А.н. — пераважна мірнага руху, нацэленага на выхаванне самасвядомасці народа, развіццё яго мовы, л-ры, інш. відаў мастацтва, грамадскай думкі, на стварэнне незалежных ад улад сац.-культ. структур — аматарскіх і прафес. суполак, партый, нац. друку, кнігавыдавецтваў, набліжэння школы і царквы да традыцый нац. культуры. Прарокам новай хвалі А.н. быў Ф.Багушэвіч, які вызначыў сутнасць бел. нац. ідэі. За нац. самавызначэнне выступіў падп. час. «Гомон». Пасля рэв. 1905—07 рух набыў масавы характар і даў значныя вынікі — нац. класічную л-ру (творчасць Я.Купалы, Я.Коласа, М.Багдановіча, М.Гарэцкага, А.Гаруна і інш.), развіццё кнігадрукавання і бел.

Да арт. **Адраджэнне**. Майсей перад народам. Гравюра Ф.Скарыны з тытульнага ліста кнігі «Другі закон». 1519.

перыяд. друку («Наша ніва», «Наша доля», «Маладая Беларусь» і інш.), станаўленне нац. школы ў тэатр., муз. і інш. відах мастацтва, арг-цыя нац. паліт. партый і рухаў, пачатак бел. асветы. Завяршальным звяном гэтага этапу А.н. была барацьба за паліт. самавызначэнне беларусаў і абвяшчэнне суверэннай *Беларускай Народнай Рэспублікі* (1918). Ва ўмовах БССР А.н. выявілася, ў практычным ажыццяўленні ў 1920-я г. палітыкі *беларусізацыі*, у выніку якой створаны нац. школа, навука, масавы друк, тэатральнае, выяўл., муз. і інш. прафес. віды мастацтва, нац. эканоміка і структура дзярж. кіравання. Новы этап А.н., пераважна на ўзроўні літ.-маст. творчасці грамадскай думкі, пачаўся ў 2-й пал. 1950-х г. ва ўмовах частковага пераадолення вынікаў бальшавіцка-сталінскай палітыкі: бел. культура набыла сусв. вядомасць, адраджаліся яе страчаныя, забароненыя і разбураныя пласты, даследаваліся культ. традыцыі. Аднак у 1970—80-я г. склалася небывала цяжкае становішча ў бел. культуры ў выніку разбурэння крыніц, што жывілі яе (жывое бытаванне нац. мовы ў грамадстве, фальклор і інш. віды аўтэнтычнай культуры). Перспектывы чарговага этапу А.н. залежаць ад рэалізацыі ідэй нац. суверэнітэту, замацаваных у Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і інш. заканад. актах краіны.

*Літ.*: Богданович М. Белорусское возрождение. М., 1916 (факс. выд. Мн., 1991); Ігнатоўскі У. Кароткі нарыс нацыянальна-культурнага адраджэння Беларусі. 2 выд. Мн., 1921; Шантыр Ф. Патрэбнасць нацыянальнага жыцця для беларусаў і Самаадзначэння народу. Слуцк, 1918 (факс. выд. Мн., 1992). *У.М.Конан.*

**АДРА́Р-ІФАРА́С** (франц. Adrar des Iforas), Іфарас, пустыннае пласкагор'е на Пд Сахары, пераважна ў Малі. Сярэднія выш. 700 м, найб. да 1000 м. Складзена са стараж. гранітаў. Уздоўж сухіх далін (уэдаў), якія праразаюць масіў, апустыненыя саванны з зараснікамі акацый, ксерафітных злакаў, на вяршынях — горныя пустыні. Рэдкія аазісы.

**А́ДРАС** (франц. adresse) у вылічальнай тэхніцы, лічбавае або лічбава-літарнае абазначэнне (код) месца захоўвання інфармацыі ў ЭВМ. Напр., нумар ячэйкі памяці, дарожка на магн. дыску. У многапраграмных ЭВМ А., што зададзены ў праграме, звычайна не супадае з А. рэчаіснага *запамінальнага прыстасавання* і адшуканне патрэбнай ячэйкі памяці выконваецца з дапамогай апаратных і праграмных сродкаў. У машыне А. пераўтвараецца ў сістэму сігналаў кіравання, якія забяспечваюць зварот да пэўнай зоны памяці.

**АДРАСА́Т** (ням. Adressat), атрымальнік (асоба, установа), якому адрасавана паштовае адпраўленне.

**А́ДРАСНАЯ МО́ВА** ў вылічальнай тэхніцы, фармальная мова для апісання працэсаў пераўтварэння інфармацыі ў ЭВМ. Кожны элемент інфармацыі адпавядае пэўнаму адрасу (напр., нумару ячэйкі *памяці ЭВМ*); некаторыя адрасы могуць адпавядаць інш. адрасам. Напр., калі элемент інфармацыі (адрас) b адназначна адпавядае адрасу a, то ў А.м. гэта запісваецца формулай 'a = b (адрасная функцыя). Вылічэнне новых значэнняў і іх засылка на пэўныя адрасы задаюцца адраснай формулай (2 адрасныя функцыі, злучаныя знакам засылкі =>). Запіс b => a азначае, што элемент b засылаецца на адрас a, пасля чаго 'a = b. Адрасны алгарытм (паслядоўнасць адрасных формул і інш. сімвалаў) спец. праграмамі-транслятарамі пераўтвараецца ў *праграму* на мове ЭВМ.

**АДРА́СТ**, у грэч. міфалогіі цар *Аргаса*. Узначальваў няўдалы паход на *Фівы* і выратаваўся дзякуючы хуткасці свайго

боскага каня. Удзельнічаў у пераможным паходзе эпігонаў на Фівы, у якім страціў сына Эгіялея і памёр ад гора. Паводле другога міфа, А. кінуўся ў агонь разам з сынам Гіпаноем.

**АДРАЎНЕ́ННЕ**, лігніфікацыя, змяненне клетачных абалонак раслін пад уздзеяннем *лігніну*, які запаўняе прамежкі паміж мікрафібрыламі цэлюлозы. Абалонка клеткі пры гэтым страчвае эластычнасць, робіцца цвёрдая, павялічваецца агульная трываласць расліны, устойлівасць абалонкі клеткі супраць мікраарганізмаў і грыбоў. А. клетачных абалонак характэрна для ўсіх вышэйшых раслін, акрамя імхоў. Адраўнелыя клеткі ўтвараюць драўніну і склеранхіму.

**АДРО́К**, адказ, выхад, права селяніна ў ВКЛ на пераход ад аднаго феадала да другога; тое, што і *выхад сялянскі*.

**АДРО́НЫ** (ад грэч. adros вялікі, значны), элементарныя часціцы, якім уласцівыя *моцныя ўзаемадзеянні*. Складаныя аб'екты, што нагадваюць ядры атамаў, дзе ролю пратонаў і нейтронаў адыгрываюць кваркі. Да А. належаць *барыёны*, *мезоны* і ўсе *рэзанансы*. Існаванне вял. колькасці А. (каля 200) робіць вельмі важнай праблему іх класіфікацыі, якая праводзіцца на аснове мадэлі *кваркаў*. Пры сутыкненнях А. і *анігіляцыі* электрона і пазітрона з пераствараннем у А. ўзнікаюць т.зв. адронныя струмені, якія сведчаць пра паходжанне ад кваркаў. На Беларусі даследаванні ўласцівасцяў А. вядуцца ў Ін-це фізікі АН (з 1950-х г.), БДУ і Гомельскім ун-це. Гл. таксама *Узаемадзеянні элементарных часціц*, *Ядзерныя сілы*.

*І.С.Сацункевіч.*

**АДРО́Ў**, рака на У Беларусі, правы прыток Дняпра. Даўж. 75 км. Пл. вадазбору 676 км$^2$. Пачынаецца на паўн. схіле Аршанскага ўзв., вусце на паўд. ускраіне г. Орша. Цячэ ў Аршанскім, Сенненскім і Талачынскім р-нах Віцебскай вобл. Даліна спачатку трапецападобная, ніжэй карытападобная, шыр. 0,6—0,8 км.

Пойма пераважна двухбаковая, шыр. 0,1—0,3 км. Рэчышча ў вярхоўі каналізаванае, далей звілістае. Берагі нізкія, у сярэднім і ніжнім цячэнні стромкія. Сярэднегадавы расход вады ў вусці 4,4 м$^3$/с. На веснавы перыяд прыпадае каля 70% гадавога сцёку. Ледастаў з сярэдзіны снеж. да канца сакавіка. Выкарыстоўваецца як водапрыёмнік меліярацыйных сістэм. У ніжнім цячэнні А. — г. Баранъ.

**АДРУ́Б**, гл. *Водруб*.

**АДРЫ́ЖЫН**, вёска ў Беларусі, у Іванаўскім р-не Брэсцкай вобл., на паўд.-зах. ад Беразе воз. Пясчанае. Цэнтр сельсавета і калгаса «Кастрычнік». За 28 км на Пд ад г. Іванава, 168 км ад Брэста, 27 км ад чыг. ст. Янаў-Палескі. 917 ж., 332 двары (1994). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, аддз. сувязі. Каля А. стаянка канца палеаліту — пач. мезаліту (11—6-е тысячагоддзі да н.э.).

**АДРЫ́НА**, пуня, 1) старадаўняя гасп. пабудова на Беларусі для захоўвання неабмалочанай збажыны, сена, саломы, с.-г. інвентару. Уваходзіла ў гасп. комплекс сядзібы. Прамавугольны ў плане зрубны, каркасны («замётам у шулы» і з плятня) будынак, накрыты 2-схільнай ці вальмавай страхой на сохах, «дзядках», кроквах. У маёнтках 16—19 ст. будавалі вял. доўгія А., перагароджаныя ўнутры на некалькі адсекаў, кожны з якіх меў самастойны ўваход. Найб. пашырана ў зах. і цэнтр. Беларусі, ва ўсх. раёнах часцей наз. сянніца, пуня. 2) Да 17 ст. спальня ў жылым памяшканні або халодны будынак, у якім жылі летам.

**АДРЫЎНО́Е ЦЯЧЭ́ННЕ**, *цячэнне*, пры якім паток вадкасці (газу), што абцякае цела, адрываецца ад яго паверхні з утварэннем віхравой зоны. Узнікае каля паверхні цела з крывалінейнымі ўтваральнымі (напр., сферы, крыла самалёта), пры наяўнасці вязкага *пагранічнага слоя* і павышэння ціску ў напрамку цячэння. Уплывае на гідрадынамічныя (аэрадынамічныя) характарыстыкі целаў, а пры звышгукавых скарасцях цячэння і на цеплавы рэжым.

**АДРЫЯ́Н** (Hadrianus) Публій Элій (24.1.76—10.7.138), рымскі імператар [117—138] з дынастыі *Антанінаў*. У 107—108 намеснік Ніжняй Панноніі, з 114 — Сірыі. Праводзіў цэнтралізацыю дзярж. устаноў, умацоўваў імператар-

скую ўладу, пашыраў сістэму дзярж. дапамог (*аліментацый*) і інш. Па загадзе А. была ажыццёўлена кадыфікацыя рым. права, выд. «Пастаянны эдыкт». На межах імперыі стварыў магутную сістэму ўмацаванняў і абарончых валоў (гл. *Адрыянаў вал*).

**АДРЫЯ́НАЎ ВАЛ** (англ. Hadrian's Wall), стараж.-рымскае абарончае збудаванне паміж вусцем р. Тайн і залівам Сольвей у Англіі. Пабудаваны пры імператару *Адрыяне* ў 122—133 для абароны Рымскай Брытаніі ад варвараў. Працягласць 122,3 км, шыр. 2,4—3,1 м, выш. 3,7—4,9 м. Меў 16 фортаў, шмат вежаў. На асобных участках умацаваны ровам (глыб. 2,7 м, шыр. 38,7 м). На Пд ад А.в. выкапаны другі роў, які, магчыма, акрэсліваў мяжу ваен. зоны. У 197, 296 і 367 захоплены варварамі, некалькі разоў аднаўляўся. Канчаткова закінуты каля 400.

**АДРЫЯНО́ПАЛЬ**, грэчаская назва горада *Эдырне* ў Турцыі.

**АДРЫЯНО́ПАЛЬСКАЯ БІ́ТВА 378.** Адбылася 9 жн. ў раёне Адрыянопаля (сучасны Эдырне, Турцыя) паміж войскамі рымскага імператара Валента і *вестготамі* на чале з Фрытхігернам, да якіх далучыліся рабы і *калоны*. У баі загінула амаль уся рым. армія і імператар. Пасля паражэння ў армію пачалі вербавацца атрады *федэратаў*, што значна аслабіла Рым. імперыю і наблізіла яе распад.

**АДРЫЯНО́ПАЛЬСКІ МІ́РНЫ ДАГАВО́Р 1829.** Падпісаны паміж Расіяй і Турцыяй 14 вер. ў г. Адрыянопаль (цяпер Эдырне, Турцыя). Завяршыў рус.-тур. вайну 1828—29 (гл. ў арт. *Рускатурэцкія войны*). Да Расіі адышлі вусце Дуная з астравамі і шэраг крэпасцяў на ўсх. беразе Чорнага м. Турцыя прызнала далучэнне да Расіі Грузіі, Імерэтыі, Мегрэліі, аўтаномію Малдавіі, Валахіі, Сербіі і права Грэцыі на ўнутр. аўтаномію. Басфор і Дарданелы абвяшчаліся адкрытымі пралівамі.

**АДРЫЯТЫ́ЧНАЕ МО́РА** (італьян. Mare Adriatico), паўзамкнёнае мора, частка *Міжземнага мора*, паміж Апенінскім і Балканскім п-авамі. Злучаецца з Іанічным м. пралівам Отранта (шыр. да 75 км). Абмывае берагі Італіі, Славеніі, Харватыі, Босніі і Герцагавіны, Югаславіі, Албаніі. Пл. 114 тыс. км$^2$. Найб. глыб. 1230 м. Усх. берагі гарыстыя, зах. нізінныя, месцамі лагунныя. Буйнейшыя залівы: Венецыянскі, Трыесцкі, Манфрэдонія. Каля ўсх. ўзбярэжжа Далмацінскія а-вы. Тэмпература вады на паверхні ў лютым 7—13 °С, у жн. 24—26 °С. Салёнасць 35—38‰. Прылівы няправільныя, паўсутачныя (да 1,2 м). Развіта рыбалоўства (сардзіны, скумбрыевыя). На шэльфе здабываюць нафту і газ. Галоўныя парты: Трыест, Венецыя (Італія), Рыека, Спліт, Дубраўнік (Харватыя), Дурэс, Влёра (Албанія). На ўзбярэжжы шмат курортаў.

**АДРЭ́ЗАК**, сегмент (матэм.), мноства лікаў або пунктаў на прамой, размешчаных паміж двума лікамі або пунктамі A і B, разам з пунктамі A і B. Каардынаты A. задавальняюць умовам $a \le x \le b$ (a і b — каардынаты канцоў A.).

**АДРЭ́ЗКІ**, у Рас. імперыі землі, адрэзаныя ад сял. *надзелаў* на карысць памешчыкаў у ходзе *сялянскай рэформы 1861*. Памяншэнне сял. надзелаў адбывалася, калі надзел быў большы за вышэйшую норму або калі ў памешчыцкім маёнтку заставалася менш за трэць (у стэпавай паласе менш за палову) прыдатных зямель. А. рабіліся і пры атрыманні сялянамі т.зв. *даравальнага надзелу*. Адрэзаныя землі былі жыццёва неабходныя сялянам (ворыва, паша, лугі і інш.). Гэта давала магчымасць памешчыкам здаваць сялянам А. ў арэнду на кабальных умовах.

На Беларусі, паводле *ўстаўных грамат*, на б.ч. тэр. Магілёўскай губ. А. склалі 12,7%, у Гродзенскай губ. — 9,8%, у Мінскай (без Навагрудскага і Пінскага пав., паводле заніжаных звестак) — 2% надзельных зямель. У склад надзелаў не ўключаліся т.зв. прыёмныя землі, што знаходзіліся ў часовым карыстанні сялян, іх пазбавілі і *сервітутаў*. У час *паўстання 1863—64* царызм пайшоў на некат. ўступкі (вернуты частка адрэзаных зямель і права часова карыстацца сервітутнымі ўгоддзямі, на 20% паменшаны выкупныя плацяжы і інш.), але гэта не змяніла грабежніцкага характару рэформы. *В.П.Панюціч.*

**АДРЭНАКАРТЫКАТРО́ПНЫ ГАРМО́Н**, картыкатрапін (АКТГ), гармон пярэдняй долі гіпофіза, які стымулюе функцыю кары надныракавікаў (выпрацоўку картызолу). Поліпептыд складаецца з 39 рэшткаў амінакіслот. Выдзяленне АКТГ рэгулюецца гармонам гіпаталамуса кортыкаліберынам. На яго сакрэцыю ўплываюць антыдыурэтычны гармон, катэхаламіны, вазаактыўны інтэрстынальны пептыд, картызол, ангіятэнзін. Пры дзеянні АКТГ на кару надныракавікаў стымулюецца яе рост, паскараецца сінтэз бялку і РНК, павялічваецца сінтэз і сакрэцыя стэроідаў надныракавікаў, што паскарае пераўтварэнне халестэролу ў прэгненалон. АКТГ у вял. колькасці можа выклікаць актывацыю ліпазы і ўзмацненне ліполізу, стымуляваць сакрэцыю інсуліну падстраўнікавай залозай. Прэпараты АКТГ атрымліваюць з гіпофіза свіней, авечак; выкарыстоўваюць як лек. сродкі пры захворванні сістэмы крыві, рэўматоідным артрыце, падагры, розных алергічных хваробах і інш.

**АДРЭНАЛІ́Н**, гармон мазгавога слоя надныракавікаў. Вылучаны з надныракавікаў жывёл у 1985. Крыніцай утварэння А. ў арганізме з'яўляюцца амінакіслоты тыразін і фенілаланін. Стымулюе работу сэрца, звужае крывяносныя сасуды, павышае крывяны ціск, расслабляе мускулатуру бронхаў і страўніка, расшырае зрэнкі, павышае бялковы, вугляводны і тлушчавы абмен. Прымяняецца пры вострым зніжэнні артэрыяльнага ціску, нечаканым спыненні работы сэрца (уводзіцца ўнутрысардэчна), *алергічных хваробах*, анафілактычным шоку. Колькасць А. ў крыві павялічваецца пры эмацыянальных нагрузках (*стрэсе*) і цяжкай мышачнай рабоце.

**АДРЭНАЛІ́ТЫКІ**, лекавыя сродкі, якія ўзаемадзейнічаюць з пэўнымі тыпамі *адрэнарэцэптараў*, зніжаюць або блакіруюць уздзеянне на іх *медыятараў* — *норадрэналіну*, *адрэналіну*, дафаміну. Адрозніваюць α-А. (фанталамін, трапафен, празазін), якія расшыраюць крывяносныя сасуды, паляпшаюць крывяток у органах і тканках, зніжаюць артэрыяльны ціск, і β-А. (анапрылін, тразікор, кардан, атэналол), якія запавольваюць і аслабляюць работу сэрца, зніжаюць артэрыяльны ціск.

α-А. выкарыстоўваюць пры захворванні перыферычных сасудаў (эндартэрыітах, хваробе Рэйно, трафічных парушэннях); β-А. — пры лячэнні ішэмічнай хваробы сэрца (стэнакардыя, інфаркт міякарда), гіпертанічнай хваробе. Пры іх ужыванні ёсць небяспека спазмы бронхаў і звужвання перыферычных сасудаў.

**АДРЭНАМІМЕ́ТЫКІ**, лекавыя сродкі, якія выклікаюць фізіял. эфекты, падобныя на ўздзеянне *медыятараў* — *норадрэналіну*, *адрэналіну*, дафаміну. У залежнасці ад тыпу *адрэнарэцэптара*, з якім узаемадзейнічаюць А., іх падзяляюць на α-, β- і αβ-А.

α-А. (мезатон, нафтызін) звужаюць крывяносныя сасуды, павышаюць артэрыяльны ціск. Выкарыстоўваюць пры рэзкім паніжэнні артэрыяльнага ціску (гіпатаніі) і мясцова — для звужэння сасудаў (пры насмарку, кан'юнктывітах і інш.). β-А. (ізадрын, салбутамол) стымулююць работу сэрца, ліквідуюць бронхаспазму, актывізуюць абмен рэчываў. Ужываюць пры лячэнні бранхіяльнай астмы і некаторых парушэннях сардэчнага рытму. α, β-А. (адрэналін, эфедрын) стымулююць работу сэрца, звужаюць сасуды, павышаюць артэрыяльны ціск, актывізуюць абмен рэчываў.

**АДРЭНАРЭЦЭ́ПТАРЫ**, адрэнарэактыўныя сістэмы, спецыфічныя біяхім. структуры клетак, якія ўзаемадзейнічаюць з *медыятарамі* — *адрэналінам*, *норадрэналінам* і некаторымі лек. рэчывамі. Вынікам узаемадзеяння з'яўляецца актывацыя або тармажэнне адпаведнай функцыі клеткі, потым органа і фізіял. сістэмы. Канчатковая будова А. не вызначана. Яны падзяляюцца на α- і β-А. α-А. найб. адчувальныя да норадрэналіну; пры іх актывацыі звужаюцца сасуды, скарачаецца матка, селязёнка, расшыраюцца зрэнкі. β-А. найб. адчувальныя да ізадрыну, пры іх узбуджэнні сасуды расшыраюцца, бронхі расслабляюцца, затарможваецца скарачэнне маткі, пачашчаецца рытм сардэчных скарачэнняў.

**АДРЭНЕРГІ́ЧНЫЯ НЕРВО́ВЫЯ ВАЛО́КНЫ**, гл. ў арт. *Медыятары*.

**АДСАРБЕ́НТЫ**, штучныя і прыродныя матэрыялы з развітой паверхняй, на якой адбываецца *адсорбцыя* рэчываў. Уласцівасці А. залежаць ад хім. саставу, фіз. стану паверхні, характару сітавіны і ўдз. паверхні. А. бываюць несітаватыя і сітаватыя.

Несітаватыя А. (молатыя крышталі, часцінкі дыму, сажа, аэрасіл) з удз. паверхняй ад 1 да 500 м$^2$/г атрымліваюць тэрмічным раскладаннем ці няпоўным згараннем вугляводародаў, пры спальванні элементаарган. ці галагенных злучэнняў. Сітаватыя А. (*сілікагель, алюмагель, актыўны вугаль*), удз. паверхня якіх дасягае 1000 м$^2$/г, атрымліваюць хім. спосабамі апрацоўкі зыходных матэрыялаў, высушваннем геляў, сінтэзам сітаватых крышталёў тыпу *цэалітаў* ці тэрмічным раскладаннем карбанатаў, аксалатаў, гідраксідаў металаў, некаторых палімераў. Гл. таксама *Адсорбер*, *Храматаграфія*.

**АДСО́РБЕР**, асноўны апарат тэхн. установак для *адсорбцыі*. Адрозніваюць А. перыядычнага і бесперапыннага дзеяння (т.зв. гіперсорберы).

У А. перыядычнага дзеяння адсорбцыя і *дэсорбцыя* адбываюцца папераменна: спачатку *адсарбент* насычаюць пэўным рэчывам, потым яго адганяюць, кандэнсуюць, сушаць гарачым газам і пасля ахаладжэння паўтараюць цыкл. У гіперсорберах зярністы адсарбент перамяшчаецца па вертыкальнай калонцы, у верхняй частцы якой адбываецца адсорбцыя, у ніжняй пад дзеяннем нагрэву — дэсорбцыя. Выкарыстоўваецца таксама А. бесперапыннага дзеяння з кіпячым (псеўдазвадкаваным) слоем адсарбенту.

**АДСО́РБЦЫЯ** (ад лац. ad... на, да + sorbere паглынаць), паглынанне рэчыва з газавага або вадкага асяроддзя (адсарбату) паверхняй, мікрасітавінамі цвёрдага цела (*адсарбенту*) ці вадкасці. А. — прыватны выпадак *сорбцыі*, якая ўключае *абсорбцыю*. У аснове А. ляжаць асаблівыя ўласцівасці рэчыва ў паверхневым слоі, колькасна яна характарызуецца *паверхневым нацяжэннем*. Падзяляецца на фізічную А. і *хемасорбцыю*, без рэзкага размежавання паміж імі; часта спалучаецца ў адзіным працэсе.

Фізічная А. — вынік міжмалекулярных узаемадзеянняў (дысперсных сіл і сіл электрастатычнага характару); менш трывалая, абарачальная (адначасова адбываецца *дэсорбцыя*) працякае адвольна з памяншэннем паверхневай свабоднай энергіі і выдзяленнем цяпла. Скорасць фіз. А. залежыць ад хім. прыроды і геам. структуры адсарбенту, канцэнтрацыі і прыроды рэчываў, што паглынаюцца, т-ры, дыфузіі і міграцыі малекул адсарбату; калі яна роўная скорасці дэсорбцыі, настае адсарбцыйная раўнавага. Пры хемасорбцыі малекулы адсарбату і адсарбенту ўтвараюць хім. злучэнні.

Велічыню А. адносяць да адзінкі паверхні ці масы адсарбенту; яна павялічваецца пры павышэнні канцэнтрацыі адсарбату і памяншаецца пры павышэнні т-ры. Пры цвёрдых адсарбентах велічыню А. вызначаюць па колькасці паглынутага рэчыва ці па змене канцэнтрацыі адсарбату; пры вадкіх — па змене паверхневага нацяжэння. А. адыгрывае важную ролю ў цеплаабмене, стабілізацыі калоідных сістэм (гл. *Дысперсныя сістэмы*, *Каагуляцыя*, *Міцэлы*), у гетэрагенных рэакцыях (гл. *Тапамічныя рэакцыі*, *Каталіз*). Выкарыстоўваецца ў храматаграфіі, прамысл. тэхналогіях, мае месца ў многіх біял. і глебавых працэсах. А. ў біялагічных сістэмах — першая стадыя паглынання рэчываў з навакольнага асяроддзя субмікраскапічнымі калоіднымі структурамі, арганеламі і клеткамі. У рознай ступені ўласціва працэсам функцыянавання біял. мембран, узаемадзеяння ферментаў з субстратам, антыцелаў з антыгенамі (на пач. стадыі), нейтралізацыі таксічных агентаў, усмоктвання пажыўных рэчываў і інш., дзе істотнае значэнне маюць паверхневыя ўласцівасці асобных кампанентаў біял. сістэм. У мед. практыцы індыферэнтнымі, нерастваральнымі адсарбентамі карыстаюцца для выдалення з арганізма соляў цяжкіх металаў, алкалоідаў, харч. інтаксікантаў, пры метэарызме, вонкава — у выглядзе прысыпак, мазяў і пастаў — пры запаленні скуры і слізістых абалонак для падсушвання. На з'явах А. грунтуецца шэраг метадаў біяхім. даследаванняў.



Адсорбер перыядычнага дзеяння: 1 — корпус; 2 — сітаваты адсарбент; 3 — рашотка.

Адсорбер з кіпячым слоем адсарбенту: 1 — корпус; 2 — кіпячы слой; 3 — рашотка; 4 — трубка.

*Літ.*: Адамсон А. Физическая химия поверхностей: Пер. с англ. М., 1979; Кельцев Н.В. Основы адсорбционной техники. 2 изд. М., 1984.

**АДСТА́ЎКА**, 1) у дарэвалюцыйнай Расіі з 18 ст. ў шырокім сэнсе — усякае звальненне з дзярж. службы (ваен. або цывільнай). 2) Поўнае вызваленне асоб афіцэрскага складу, прапаршчыкаў і мічманаў ад нясення ваен. службы па ўзросце, стане здароўя ці інш. прычынах; адзін з відаў звальнення з абавязковай ваен. службы. 3) У практыцы дэмакр. краін А. ўрада (асобных яго членаў) або кіраўнікоў выканаўчай улады — складанне імі сваіх паўнамоцтваў у сувязі з вынясеннем ураду вотуму недаверу або ганьбавання, унутр. рознагалоссямі ва ўрадзе і інш.

**АДСТО́ЙВАННЕ**, гл. *Седыментацыя*.

**АДСТО́ЙНІК**, 1) збудаванне для адстойвання (ачысткі) вадкіх адходаў і сцёкаў ад узважаных рэчываў пад дзеяннем сілы цяжару. Адрозніваюць А.: аднакамерныя [паслядоўна ці паралельна злучаныя з каналам] і шматкамерныя; гарызантальныя, вертыкальныя і радыяльныя; з мех. ачысткай ад нанасаў, гідраўл. прамываннем і камбінаваныя; бесперапыннага і перыядычнага дзеяння. Будуюць з бетону, жалезабетону, каменю, драўніны. Выкарыстоўваюць для ачысткі вады ў сістэмах гідравузлоў, ірыгацыйных збудаванняў, водазабеспячэння і каналізацыі. 2) Прылады ў машынах і ўстаноўках, дзе адстойваецца масла, бензін і інш.

**АДСТРА́Т** (ад лац. ad пры, каля + stratum слой), сляды ўзаемадзеяння мовы прышэльцаў і тубыльцаў на фанетычным, лексічным, граматычным узроўні. Пры гэтым не адбываецца *асіміляцыі*, а абедзве моўныя сістэмы працягваюць суіснаванне (скандынаўскі ўплыў на англ. мову 9—11 ст., цюркскі А. у бел. мове, напр.: кіндзюк — зельц). Часам тэрмін «А.» ужываецца для абазначэння ўзаемапранікнення тэрытарыяльна сумежных, але не блізкародных моў (бел. і літоўскай; напр., валандацца, клыпаць). Паняцце «А.» уведзена М.Барталі ў 1936. *А.А.Кожынава.*

**АДСТРЭ́Л**, нарміраваная здабыча дзікіх жывёл з дапамогай агнястрэльнай або механічнай зброі дыстанцыйнага дзеяння. Праводзіцца ў вызначаныя гасп. ці прыродаахоўнымі органамі тэрміны і паводле ўстаноўленых імі нормаў здабычы ў прамысл., спарт. і навук. мэтах,

а таксама для аздараўлення ці аптымізацыі структуры (селекцыйны А.) папуляцый. А. відаў, занесеных у Чырвоную кнігу, забаронены. А. многіх інш. відаў рэгулюецца нормамі міжнар. і нац. прыродаахоўнага заканадаўства, ажыццяўляецца на падставе ўзгодненых *квот* (напр., А. кітоў) або выдадзеных *ліцэнзій* (на Беларусі, напр., ліцэнзійная здабыча аленяў, дзікоў і інш. звяроў). Гл. таксама *Паляванне*.

**АДСТУПЛЕ́ННЕ**, адыход, дзеянні войскаў з мэтай выхаду з-пад удараў праціўніка і заняцця больш выгаднага становішча для далейшых баявых дзеянняў. Можа быць наўмыснае і вымушанае (калі немагчыма наяўнымі сіламі ўтрымаць заняты раён і ствараецца рэальная пагроза акружэння).

**АДСТУ́ПНІЦТВА**, апастазія, адыход ад догматаў, асн. палажэнняў веравызнання. Асобу, якая адышла (адступілася) ад сваёй веры, наз. адступнікам (апастатам).

**АДСУ́ТНАСЦЬ БЕЗ ВЕ́СТАК**, у цывільным праве ўстаноўлены судом факт працяглай (не менш за адзін год) адсутнасці асобы і звестак пра яе ў месцы яе пастаяннага жыхарства. Прызнанне факта А.б.в. праводзіцца па заяве зацікаўленай фіз. або юрыд. асобы і цягне за сабой пэўныя юрыд. вынікі: над маёмасцю адсутнага ўстанаўліваецца апека, з яго маёмасці выдаецца забеспячэнне асобам, якіх ён паводле закону абавязаны ўтрымліваць, пагашаюцца даўгі па яго абавязацельствах. У выпадку яўкі ці выяўлення месца знаходжання адсутнага суд адмяняе сваё рашэнне аб прызнанні факта А.б.в. Гл. таксама *Абвяшчэнне памерлым*.

**АДУВА́НЧЫК**, тое, што *дзьмухавец*.

**АДУКАЦЫ́ЙНАЯ КАМІ́СІЯ** (Komisja Edukacji Narodowej), установа па кіраўніцтве нар. асветай у Рэчы Паспалітай; першая падобнага тыпу ў Еўропе. Засн. соймам 1773—75. Першы старшыня (1773—80) І.Я.Масальскі. Прымалі ўдзел асветнікі Г.Калонтай, І.Патоцкі, Г.Піра́мовіч, Я.Снядэцкі, І.Храптовіч і інш. Ажыццявіла рэформу школ і ун-таў у духу ідэй Асветніцтва. У 1783 зацве́рджаны «Статут, прадпісаны камісіяй народнай асветы для акадэмій і школ Рэчы Паспалітай». Школа набыла свецкую накіраванасць. Найважнейшае значэнне надавалася прадметам фізіка-матэм. цыкла, з гуманітарных навук выкладаліся польск. і лац. граматыка, геаграфія, гісторыя, заканазнаўства і інш.; з навуч. праграм была знята тэалогія. Новая сістэма адукацыі не задавальняла кансерватыўную частку памешчыкаў і духавенства. У 1794 статут адменены, А.к. распушчана.

**АДУКА́ЦЫЯ** (ад лац. educatio выхаванне), працэс і вынік набыцця сістэматызаваных ведаў, уменняў і навыкаў у навуч. установах або самаадукацыяй. У больш шырокім плане — культурна-адукац. прастора, якая ахоплівае сям'ю, разнастайныя навуч.-выхаваўчыя і пазашкольныя ўстановы, нефармальную А., сац.-пед. інфармаструктуру, адукац. працэсы на вытв-сці і ў грамадскакульт. жыцці, самаадукацыі і інш., дзе ўзнаўляецца і ўдасканальваецца інтэлектуальна-творчы і прафес.-кваліфікацыйны патэнцыял народа. Бел. нац. сістэма А. ўключае агульную, прафес. А., сямейнае, грамадскае выхаванне, самаадукацыю і самавыхаванне. У залежнасці ад аб'ёму і тэрмінаў навучання адрозніваюць: *адукацыю агульную* — пачатковы, базавы і сярэдні ўзроўні; *прафесійную адукацыю* — дапрафес. (прафесійная арыентацыя, адбор) і сярэдняя прафес. падрыхтоўка; *вышэйшую адукацыю* — падрыхтоўка спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі для розных галін навукі, тэхнікі і культуры; А. дарослых (паслядыпломная А.). Паводле формы навучання А. бывае дзённая (стацыянарная), вячэрняя і завочная, паводле адносін да царквы — свецкая (незалежная ад уплыву царквы) і канфесійная (кантралюе царква). Змест А. вызначаецца станам навукі, тэхнікі, культуры, мастацтва, міжнар. і нац. стандартамі, вучэбнымі планамі і праграмамі.

**Адстойнік:** *а* — аднакамерны паслядоўна злучаны; *б* — паралельна злучаны з каналам; *в* — пяцікамерны; *г* — перыядычнага дзеяння; 1 — канал; 2 — камера; 3 — засаўка; 4 — прамыўны канал.

Дзярж. палітыка Беларусі ў галіне А. грунтуецца на прынцыпах: даступнасць усіх відаў А.; стварэнне ўмоў для выбару формаў навучання; прыярытэт агульначалавечых каштоўнасцяў; нац.-культ. аснова А.; навуковасць; арыентацыя на сусв. ўзровень, вывучэнне і выкарыстанне вопыту развітых краін свету, запазычанне іх дасягненняў і стандартаў; гуманізм, увага да схільнасцяў і інтарэсаў асобы, магчымасць свабоднай самарэалізацыі; сувязь з грамадскай практыкай, якая гарантуе ўзаемадзеянне А. з вытв-сцю, спрыяе сацыялізацыі асобы, яе адаптацыі да розных формаў жыццядзейнасці; экалагічная накіраванасць; адзінства навучання, духоўнага і фіз. ўдасканалення; дэмакратызм (праз яго ўсталёўваецца павага і давер паміж педагогамі, навучэнцамі і бацькамі); свецкі характар, які адначасова забяспечвае грамадзянскае навучанне і выхаванне ў дзярж. навуч. установах і ахову свабоды сумлення і веравызнання чалавека; заахвочванне адукаванасці; пераемнасць і бесперапыннасць А.; выкарыстанне і развіццё нар. педагогікі беларусаў; падтрымка самаадукацыі і самавыхавання, інтэлектуальных і духоўных імкненняў асобы; абавязковасць базавай адукацыі ў якасці вызначальнага ўзроўню навучання і выхавання. Гал. мэты нац. сістэмы А.: спрыянне гарманічнаму развіццю асобы, поўнай рэалізацыі яе стваральных здольнасцяў; фарміраванне і ўмацаванне нац. свядомасці і адначасова пачуцця павагі да іншых краін і народаў свету; авалоданне дзярж. мовай; захаванне і памнажэнне інтэлектуальнай уласнасці і культ.-гіст. каштоўнасцяў бел. народа і інш. нац. супольнасцяў рэспублікі; падрыхтоўка да самаст. жыцця; садзейнічанне інтэлектуальным памкненням асобы.

Усе жыхары Беларусі забяспечваюцца роўнымі правамі і магчымасцямі для атрымання агульнай і прафес. А. з улікам нац. традыцый, індывід. патрэб, здольнасцяў; бясплатным навучаннем у дзярж. базавых школах, а таксама інш. навуч. установах. Нац. сістэма А. падтрымлівае асабліва здольных і таленавітых дзяцей; ажыццяўляе сац. дапамогу ў навучанні дзяцей з малазабяспечаных сем'яў, з разумовымі ці фіз. недахопамі, сірот, інвалідаў з маленства, дзяцей, якія не маюць апекі бацькоў. З мэтай забеспячэння цэласнай сістэмы навуч.-выхаваўчай работы па фарміраванні ўсебакова развітой асобы ў Рэспубліцы Беларусь распрацаваны шэраг заканадаўчых, дырэктыўных, нарматыўных дакументаў: законы «Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь» (1991), «Аб правах дзіцяці» (1993); канцэпцыі адукацыі і выхавання, выхавання ў нац. школе Беларусі, навучання, выхавання і падрыхтоўкі да жыцця дзяцей з недахопамі ў разумовым і фіз. развіцці (усе 1993), а таксама комплексная праграма развіцця адукацыі і выхавання на Беларусі на перыяд да 2000 г.

*А.П.Сманцар, С.В.Снапкоўская.*

**«АДУКА́ЦЫЯ»**, легальнае т-ва асветнага кірунку ў Віцебску ў студз.—вер. 1913. Аб'ядноўвала 1268 чл. розных сац. груп і паліт. партый. Заснавальнікі і кіраўнікі: Р.Н.Шулепнікаў (старшыня), К.В.Пісарэнка (нам. старшыні), В.А.Прус. Мэта т-ва — падрыхтоўка да стварэння нар. ун-та. Сацыял-дэмакраты Віцебска выкарыстоўвалі «А.» як легальную трыбуну для рэв. прапаганды. Закрыта за антыўрадавую дзейнасць.

**АДУКА́ЦЫЯ АГУ́ЛЬНАЯ**, працэс і вынік авалодання асновамі навук, неабходнымі чалавеку для разумення з'яў

прыроды і грамадства. Аснова політэхн. і прафес. адукацыі. А.а. атрымліваюць у навуч. установах і самаадукацыяй. Асн. структурнай адзінкай у сістэме *адукацыі* з'яўляецца агульнаадук. школа (дзярж., грамадскія і прыватныя). На аснове Статута сярэдняй агульнаадук. школы ў Рэспубліцы Беларусь дзейнічаюць пачатковыя (1—4-ы кл.), 9-гадовыя (базавыя; 1—9-ы кл.), *сярэднія агульнаадукацыйныя школы* (1—11, 12-ы кл.), з паглыбленым вывучэннем прадметаў, школы-інтэрнаты, спец. школы, *ліцэі, гімназіі*; для працоўнай моладзі створаны вячэрнія (пазменныя) сярэднія агульнаадукац. школы. Змест А.а. вызначаецца агульнадзярж. (абавязковым стандартам для пэўнага ўзроўню адукацыі) і школьным (устанаўліваецца з улікам сац.-эканам. абставін, інтарэсаў вучняў) кампанентамі. Базісная частка вучэбных планаў і праграм А.а. ўяўляе сабой сукупнасць абавязковых і даступных для ўсіх вучняў ведаў і ўменняў, неабходных адукаванаму чалавеку незалежна ад яго прафесіі. Дыферэнцыяцыя навучання праводзіцца на розных узроўнях складанасці з улікам выяўленых здольнасцяў. На розных этапах развіцця грамадства існуе пэўны сац. неабходны і агульнадаступны ўзровень адукацыі. На Беларусі гэта 9-гадовая (базавая) адукацыя, якая гарантуецца дзяржавай. У 1994/95 навуч. г. на Беларусі 5062 агульнаадук. школы, у т.л. 4971 дзённая і 91 вячэрняя (пазменная), у якіх 1561,8 тыс. вучняў.

*М.С.Фяськоў, А.А.Канавальчык.*

**«АДУКА́ЦЫЯ І ВЫХАВА́ННЕ»**, штомесячны часопіс. Выходзіць з 1992 у Мінску на бел. мове (асобныя матэрыялы на англ., ням. і рус. мовах). Асвятляе навук.-тэарэтычныя і метадалагічныя пытанні грамадскага і сямейнага выхавання, падрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі пед. кадраў, замежны вопыт у галіне адукацыі і выхавання.

**АДУ́КТ** (ад лац. adductus прыведзены, прыцягнуты), 1) малекулярны комплекс ці злучэнне, што ўтвараецца ў *далучэння рэакцыях*. 2) Рэчывы невядомай будовы ці злучэнні, для якіх цяжка ўтварыць назву па правілах *наменклатуры хімічнай*.

**АДУ́ЛА** Тадэвуш Іванавіч (н. 14.9.1945, в. Хралы Астравецкага р-на Гродзенскай вобл.), бел. філосаф. Д-р філас. н. (1994). Скончыў БДУ (1971). Даследуе гісторыю філас. і грамадска-паліт. думкі, праблемы духоўнай культуры. Асн. працы: «Культура, філасофія і духоўны свет чалавека: Тэарэтыка-метадалагічны аспект» (1986), «Філасофія ў сістэме духоўнай культуры: Праблемы сацыяльнага функцыянавання» (1993) і інш.

**АДУЛЯ́Р** (ад назвы радовішча ў гарах Адула ў Швейцарыі), мінерал, адносна чыстая разнавіднасць *артаклазу*. Бясколерны, паўпразрысты да празрыстага. Трапляецца ў выглядзе крышталёў, часта ўтварае друзы. Характэрны для кварцавых жылаў альпійскага тыпу, сустракаецца ў пегматытах, рудных жылах. А. з ірызацыяй у блакітнавата-сініх тонах (месяцавы камень) — каштоўны камень. Выкарыстоўваецца ў шкляной і керамічнай вытв-сці.

**АДУ́Р** (Adour), рака на ПдЗ Францыі. Даўж. 335 км, пл. бас. 22 тыс. км². Пачынаецца ў цэнтр. раёне Пірэнеяў, перасякае плато Арманьяк і Гаронскую ніз., упадае ў Біскайскі зал.

Разводдзе і паводкі вясной і восенню ад раставання снягоў і ліўняў у Пірэнеях. Сярэдні расход вады 360 м³/с. Выкарыстоўваецца для арашэння. Суднаходства ў ніжнім цячэнні. ГЭС. На А. гарады Баёна, Тарб.

**АДУШАЎЛЁНАСЦЬ - НЕАДУШАЎЛЁНАСЦЬ**, лексіка-граматычная катэгорыя, якая паказвае адносіны абазначаных назоўнікамі прадметаў да жывой і нежывой прыроды. Адушаўлёныя назоўнікі абазначаюць людзей і розных жывых істот («Рыгор», «настаўніца», «тыгр», «ластаўка», «карась», «камар»), неадушаўлёныя — расліны, прадметы, апрадмечаныя з'явы і паняцці («клён», «машына», «раса», «цемра», «свядомасць»).



Адуляр.

Граматычна А.-н. праяўляецца ў форме вінавальнага склону мн. л.: у адушаўлёных назоўніках супадае з формай роднага, а ў неадушаўлёных — назоўнага склону («бачыць людзей — бачыць дрэвы», «лавіць язёў — лавіць сняжынкі»). Пад катэгорыю адушаўлёных часам граматычна падводзяцца некаторыя неадушаўлёныя прадметы і наадварот.

*Л.І.Бурак.*

**АДХА́РКВАЛЬНЫЯ СРО́ДКІ**, прыродныя або штучна сінтэзаваныя лекавыя сродкі, якія разрэджваюць макроту, паляпшаючы яе выдаленне, павышаюць актыўнасць слізістай бронхаў, паляпшаюць газаабмен, аслабляюць запаленчыя працэсы. Ужываюць пры вострых рэспіраторных захворваннях, хранічных бранхітах, запаленні лёгкіх, бронхаэктатычнай хваробе і інш. Найб. моцныя з іх: адвары і настоі каранёў алтэю, дзівасілу, падбелу, трыпутніку, травы тэрмопсісу, браміды натрыю і калію. Да А.с., якія разрэджваюць макроту, адносяцца ферментныя (трыпсіл, рыбануклеаза) і атрыманыя шляхам хім. сінтэзу (ацэтылцыстэіл, бромгексін).

**АДХІЛЯ́ЮЧАЯ СІ́ЛА ВЯРЧЭ́ННЯ ЗЯМЛІ́**, адна з сіл *інерцыі*, якая дае магчымасць улічваць уплыў вярчэння Зямлі вакол сваёй восі на рух любога цела адносна зямной паверхні; прыватны выпадак *Карыяліса сілы*. Адхіляе цялы, якія рухаюцца ўздоўж зямной паверхні, управа ў Паўн. паўшар'і, улева — у Паўднёвым; адыгрывае значную ролю ў развіцці атм. працэсаў, змене контураў берагоў рэк і інш.

**АДХО́ДЫ**, рэшткі сыравіны, не прыдатныя для вытв-сці пэўнай прадукцыі, таксама рэчывы (цвёрдыя, вадкія і газападобныя), што ўзнікаюць у ходзе тэхнал. працэсаў, і энергія, якія не падлягаюць утылізацыі ў пэўнай вытв-сці. Адрозніваюць А. прамысл. (у т.л. радыеактыўныя), с.-г., быт. (камунальныя), энергет. (адыходзячае цяпло), харчовыя і інш. А. адной вытв-сці могуць быць сыравінай для інш. яе галін. Каб паменшыць тэхнагенны ўплыў А. на прыроду, ствараюцца малаадходныя і безадходныя тэхналогіі.

**АДЧУВА́ЛЬНАСЦЬ** (фізіял.), 1) здольнасць жывых арганізмаў успрымаць раздражненні, якія зыходзяць з вонкавага і ўнутр. асяроддзя. Стварае магчымасць для фарміравання адаптыўных рэакцый. Адрозніваюць віды А.: тэмпературную, смакавую, светлавую, скурную і інш. У ходзе эвалюцыі ў чалавека і жывёл фарміруюцца спецыялізаваныя нерв. ўтварэнні (*рэцэптары*), прыстасаваныя да ўспрымання вызначанага віду раздражнення (механарэцэптары, хемарэцэптары, фотарэцэптары і інш.) у межах парога адчувальнасці. Узбуджальнасць рэцэптараў няўстойлівая і залежыць ад іх стану і адпаведнай настройкі цэнтр. нерв. сістэмы. 2) У дыферэнцыяльнай псіхалогіі — павышаная гатоўнасць да эфектыўных рэакцый. 3) У псіхафізіцы — велічыня, адваротна прапарцыянальная парогу адчування (чым ніжэй парог, тым вышэй А.). Адпаведна адрозніваюць абсалютную і дыферэнцыяльную (рознасную) А. Выкарыстанне новых тэарэт. уяўленняў (тэорыі выяўлення сігналаў) у псіхафізіцы спрыяла ўзнікненню больш абагульненых вызначэнняў А., незалежных ад паняцця парог адчування.

**АДЧУВА́ЛЬНЫ ЭЛЕМЕ́НТ**, успрымальны орган датчыка ў вымяральных прыладах і сістэмах аўтам. кіравання і рэгулявання, які рэагуе на змену якой-н. фіз. велічыні. Ператварае лікавае значэнне гэтай велічыні непасрэдна ці праз прамежкавыя звенні ў выхадны сігнал, зручны для дыстанцыйнай перадачы і далейшай апрацоўкі. Як А.э. выкарыстоўваюцца мембраны, сільфоны, тэрмапары, тэрма- і электрасупраціўленні, п'езакварцавыя пласціны і інш.

**АДЧУВА́ННЕ**, псіхічны працэс адлюстравання асобных уласцівасцяў і з'яў аб'ектыўнага свету пры іх непасрэдным уздзеянні на органы пачуццяў. Узнікаюць ад таго, што раздражняльнікі дзейнічаюць на ўспрымальныя часткі аналізатараў—рэцэптары; нервовыя імпульсы дасягаюць галаўнога мозга і выклікаюць А. Спецыфіка А. чалавека, іх дасканаласць абумоўлены сац.-гіст. прычынамі, працоўнай дзейнасцю. А. з'яўляюцца крыніцай непасрэднай інфармацыі аб навакольным свеце. Як *адлюстраванне* аб'ектыўных уласцівасцяў рэчаў А. з'яўляецца сродкам пазнання рэчаіснасці. У чалавека найб. развіты зрокавыя А. Потым ідуць А. слыху, смаку, нюху, дотыку. Працэсы, што адбываюцца ў арганізме, выклікаюць арганічныя А. (голад, смагу, боль). Існуюць таксама А. вібрацыйныя, руху і становішча органаў цела, раўнавагі і інш.

У працэсе пазнання А. выконваюць функцыі: як субстрат *успрымання* даюць апошняму магчымасць адлюстраваць структуру вонкавых прадметаў; выступаюць у ролі прыкмет аб'ектыўных уласцівасцяў вонкавых прадметаў пры ўмове, што ўзаемасувязь паміж якасцю А. і ўласцівасцю прадмета раней вядомая; з'яўляюцца асновай для фарміравання элементарных *уяўленняў*. Праблематыка А. распрацоўваецца ў псіхафізіцы сенсорных працэсаў і розных раздзелах *фізіялогіі*. Разнастайнасць А. адлюстроўвае якасную разнастайнасць навакольнага свету. А. дапамагаюць чалавеку прыстасоўвацца да асяроддзя і ўздзейнічаюць на яго.

*Літ.*: Ковалгин В.М. Рефлекторная теория ощущений. Мн., 1963; Ананьев Б.Г. Теория ощущений. Л., 1961.

**АДЧУЖЭ́ННЕ**, аб'ектыўны сац. працэс, які характарызуецца ператварэннем у пэўных умовах чалавечай дзейнасці і яе вынікаў у самаст. сілу, што пануе над чалавекам і варожая яму. Праяўляецца ў процістаянні асн. перадумоў працы (уласнасць, кіраванне і арг-цыя) суб'екту працы, дзярж.-бюракратычнай машыны радавым членам грамадства, у пачуццях апатыі, адзіноцтва, атрафіі да высокіх сац. і гуманіст. каштоўнасцяў.

Першапачаткова сфармулявана і выкарыстана Т.Гобсам, Дж.Локам, Ж.Ж.Русо для абгрунтавання дагаворнага паходжання дзяржавы як увасаблення перанесеных на яе («адчужаных») людзьмі сваіх пэўных правоў і свабод. Для Гегеля А. як уласцівасць сусв. духу (абсалютнай ідэі) ёсць пераход яго ў працэсе дыялект. развіцця ў сваю процілегласць — прыродную і сац. рэальнасць; для Феербаха — гэта стварэнне чалавечай свядомасцю рэліг.-ілюзорнага свету багоў, анёлаў і інш. пад уплывам усеагульнай залежнасці чалавека ад варожых яму сіл прыроды. Калі ў Гегеля пераадоленне А. ажыццяўляецца праз усё больш глыбокае пазнанне навакольнага свету, то ў Феербаха — праз крытыку рэлігіі на аснове прынцыпаў любові і салідарнасці. Паводле Маркса, пераадоленне А. можа быць дасягнута ў ходзе пралетарскай рэвалюцыі і стварэння такога грамадства, якое выключала б эксплуатацыю чалавека чалавекам і стварала б аб'ектыўныя ўмовы для свабоднага, усебаковага развіцця асобы.

У сучаснай зах. філасофіі А. імкнуцца абгрунтаваць усе бакі крызісу грамадства — сац. і нац. прыгнёт, бюракратызацыю грамадскага жыцця, тэхнізацыю свету і разбурэнне прыроднага асяроддзя, узрастаючую бездухоўнасць мастацтва і асобы, нявер'е і атэізм, тэрарызм і злачыннасць, нават нац.-вызв. барацьбу народаў. А.Камю атаясамлівае А. з відавочнай для яго абсурднасцю чалавечага быцця ў свеце фатальнай непазбежнасці смерці індывіда. Крызіс сацыялізму і марксізму ўяўляецца як спецыфічнае А. ў грамадстве з дзярж.-калектыўнай уласнасцю, якая ўзмацняе працэс А., ператварае яго ў фатальна-антрапалагічную з'яву. Спробы пераадолення А. ў гэтым сэнсе абвяшчаюцца утапічнымі або звязваюцца са зваротам чалавека да Бога і рэлігіі, да ўцёкаў ад грамадства ў інтымна-асабістае жыццё, з маральным адраджэннем асобы і грамадства на аснове любові, салідарнасці і інш.

*Літ.*: Нарский И.С. Отчуждение и труд. М., 1983; Грицанов А.А., Овчаренко В.И. Человек и отчуждение. Мн., 1991; Geyer R.F. Alienation theories. Oxford, 1980. *І.А.Рабкоў.*

**«АДЧЫ́НЕНЫХ ДЗВЯРЭ́Й» ПАЛІ́ТЫКА**, 1) адзін са стратэгічных кірункаў знешняй палітыкі ЗША у канцы 19 — пач. 20 ст. па стварэнні спрыяльных умоў для эканам. экспансіі ў Кітаі. ЗША, прызнаючы падзел Кітая на сферы ўплыву паміж Вялікабрытаніяй, Германіяй, Францыяй, Расіяй, Японіяй і інш. дзяржавамі, патрабавала захаваць для амер. капіталу ў гэтых сферах «адчыненыя дзверы» — роўныя правы і магчымасці, ільготы і тарыфы. Афіцыйна «А.дз.» п. прызнана на *Вашынгтонскай канферэнцыі 1921—22*. У сав. гіст. л-ры наз. «Адкрытых дзвярэй» дактрына. 2) Сучасны кірунак развіцця сусв. эканомікі і гандлю, галоўны прынцып якога — узаемаадкрытасць эканомікі праз дзейнасць транснац. карпарацый і транснац. банкаў. Падтрымліваецца найб. краінамі свету: ЗША, Японіяй, Францыяй, Германіяй і інш. 3) Курс некаторых дзяржаў Азіі (Кітай, Паўд. Карэя, Малайзія, Індыя і інш.), Афрыкі (Егіпет, Нігерыя, Кенія і інш.), Лац. Амерыкі (Аргенціна, Мексіка, Багамскія Астравы і інш.), рэспублік б. СССР (Расія, Украіна, Літва, Латвія, Эстонія) на эканам. развіццё за кошт прыцягнення замежнага капіталу, тэхнікі і тэхналогій і стварэння *свабодных эканамічных зон* з ільготным падатковым рэжымам, асобнымі правамі ў сац.-эканам. і паліт. сферах.

*А.А.Чалядзінскі.*

**АДШЧЭ́П**, асколак, адбіты *адбойнікам* ад кавалка крэменю або *нуклеуса* першабытным чалавекам каменнага і бронзавага вякоў. Выкарыстоўваліся на выраб прылад працы — нажоў, сярпоў і інш.

**АДЫГЕ́ЙСКАЯ МО́ВА**, адна з *іберыйска-каўказскіх моў* (абхаза-адыгейская група чэркескай падгрупы), блізкая да кабардзінскай мовы. Пашырана ў *Адыгеі*, а таксама ў Лазараўскім і Туапсінскім р-нах Краснадарскага краю. Мае 4 дыялекты: абадзехскі, бжэдугскі, тэміргойскі (аснова літаратурнай мовы) і шапсугскі.

Паводле ладу *аглюцінатыўная мова* з рысамі полісінтэтызму. Фанетыка характарызуецца багатай сістэмай зычных (да 70 фанем) і простай — галосных (2 фанемы), сінтаксіс — наяўнасцю эргатыўнай канструкцыі. Пісьменства створана ў 1918 на аснове араб., у 1927 — лац., у 1938 — рус. графікі.

**АДЫГЕ́ЙЦЫ** (саманазва а д ы г е ), народ у *Адыгеі*. 95,4 тыс., у інш. рэгіёнах Рас. Федэрацыі і краінах СНД 125 тыс. чал. (1989). Жывуць таксама ў Турцыі і араб. краінах. Гавораць на *адыгейскай мове*. Паводле веравызнання мусульмане-суніты.

**АДЫГЕ́Я**, Р э с п у б л і к а А д ы г е я , у складзе Рас. Федэрацыі. Пл. 7,6 тыс. км$^2$. Нас. 426 тыс. чал. (1987), гарадскога 51%; адыгейцы, рускія, украінцы і інш. Сталіца — г. *Майкоп*.

**Прырода**. А. размешчана ў паўн.-зах. ч. Каўказа на левабярэжжы рэк Кубань і Лаба; паўн. ч. — на Прыкубанскай раўніне, парэзанай далінамі рэк і лагчынамі, паўд. ч. — на перадгор'ях і схілах В.Каўказа (выш. да 3238 м, г. Чугуш). Ёсць прыродны газ, буд. матэрыялы, мінер. крыніцы. Клімат умерана кантынентальны, цёплы. Сярэдняя т-ра студз. каля -2 °С, ліп. 22 °С. Ападкаў каля 700 мм за год. Безмарозны перыяд 180 дзён. Рэкі бас. Кубані (Лаба, Белая, Пшыш, Псекупс). Вадасховішчы: Краснадарскае, Шапсугскае, Акцябрскае і інш. На б. ч. тэр. — чарназёмы, пашыраны каштанавыя глебы, у гарах — шэрыя і бурыя лясныя. Шыракалістыя лясы перадгор'яў займаюць 2/5 тэрыторыі, у гарах піхта, елка, хвоя. Водзяцца зубр, серна, каўказскі алень, казуля, дзік, буры мядзведзь, выдра, барсук, ліс і інш. У А. асн. ч. *Каўказскага запаведніка*.

**Гісторыя**. Звесткі пра стараж. чалавека на тэр. А. адносяць да палеаліту. Продкі адыгаў згадваюцца ў пісьмовых крыніцах з сярэдзіны 1-га тыс. да н.э. З 4 ст. н.э. адыгі апрача жывёлагадоўлі і земляробства займаліся ганчарствам, кавальствам, ювелірным і інш. рамёствамі, падтрымлівалі гандлёвыя сувязі з народамі Каўказа, Крыма, з Іранам і Візантыяй, з генуэзскімі гарадамі-калоніямі, што існавалі да 15 ст. на марскім узбярэжжы А. Прыблізна з 13 ст. з зах.-адыгейскіх плямёнаў пачала складвацца адыгейская народнасць. У 13 ст. А. заваявана *Залатой Ардой*. З 16 ст. на землі А. спусташальныя набегі рабілі тур. султаны і крымскія ханы. Яны бралі вял. палон, насаджалі іслам, што прымусіла адыгейцаў шукаць абароны ў Расіі. У 1555—57 А. далучана да Расіі. З крас. 1917 на тэр. А. пашыралася ўлада Кубанскай рады. У студз. 1918 абвешчана сав. ўлада, з мая тэр. А. ў складзе Кубана-Чарнаморскай сав. рэспублікі, з ліп. — *Паўночна-Каўказскай савецкай рэспублікі*. Во-

сенню 1918 А. занята войскамі *Добраахвотніцкай арміі*, кіравалася адміністрацыяй *Дзянікіна ўрада*. У сак. 1920 адноўлена сав. ўлада. 27.7.1922 утворана Чэркеская (Адыгейская) аўт. вобласць, 24 жн. перайменавана ў Адыгейскую (Чэркескую), з ліп. 1928 — у Адыгейскую аўт. вобласць; адм. ц. — г. Краснадар, з 1936 — г. Майкоп. З 1937 аўт. вобласць у складзе Краснадарскага краю. У 1991 абвешчана Рэспубліка Адыгея ў складзе Рас. Федэрацыі.

**Гаспадарка**. Вядучыя галіны прам-сці: харч. (кансервавая, маслабойная, мясная, цукр., эфіраалейная, чайная і інш.); машынабуд. (станкабудаванне); лясная і дрэваапр. (вытв-сць мэблі, цэлюлозы, кардону). Газаздабыўная прам-сць. Асн. прамысл. цэнтр — Майкоп. Пасевы збожжавых (пшаніца, кукуруза, рыс) і тэхнічных (сланечнік, цукр. буракі, тытунь) культур. Вырошчваюць агародніну, бахчавыя, бульбу, кармавыя культуры. Вінаградарства і пладаводства. У жывёлагадоўлі вядучае месца займае развядзенне буйн. раг. жывёлы. Птушкагадоўля. Пчалярства. Суднаходства па р. Кубань. Аўтамаб. траса Майкоп — Дагамыс. Зах. ч. перасякае чыгунка Краснадар—Новарасійск.

**Культура**. У 1992 у А. 204 дашкольныя дзіцячыя ўстановы (21,6 тыс. дзяцей), 165 агульнаадук. школ (62,7 тыс. вучняў, больш за 5 тыс. настаўнікаў), 10 ПТВ (4,5 тыс. навучэнцаў), 6 сярэдніх спец. навуч. устаноў (7 тыс. навучэнцаў); Адыгейскі пед. ін-т (больш за 5 тыс. студэнтаў), 177 б-к. Гісторыка-краязнаўчы музей у Майкопе.

Выходзяць газеты «Адыгэ макъ» («Голас Адыга»), «Адыгейская правда» і інш.

Нар. паэзія адыгейцаў уключае паданні пра нартаў, гераічныя, ваенна-гіст. песні, песні-галашэнні, калыханкі, паляўнічыя, працоўныя, лірычныя, вясельныя і інш. Развіццё адыгейскай л-ры звязана са стварэннем у 1918 пісьменства і друку на адыгейскай мове. Першыя поспехі звязаны з імёнамі І.Цэя, М.Паранука, А.Хаткова, Т.Керашава. У 1930-я г. зроблены першыя запісы песень нар. ашуга Цуга Тэўчэжа і створаных ім паэм. У пасляваенны час плённа працавалі А.Еўтых, А.Гадагатль, Ю.Тлюстэн, Дж.Джагупаў, І.Машбаш, Х.Ашынаў і інш. Развіццю адыгейскай л-ры ў 1970—90-я г. спрыяла творчасць М.Тхаркаха, Е.Мамія, К.Кумпілава, Н.Куека, П.Кашубаева, Т.Чамокава і інш.

Найб. стараж. помнікі на тэр. А. (дальмены, наскальныя выявы, залатыя і сярэбраныя пасудзіны і фігуркі т.зв. майкопскай культуры) адносяцца да мезаліту і бронзавага веку. Да ранняга жал. веку належаць ювелірныя вырабы «звярынага стылю», кераміка, рэшткі абарончых і культавых збудаванняў. З даўніх часоў пашырана прыкладное мастацтва (залатое шыццё, разьба па дрэве і камені, лямцавыя дываны і інш.). У 1950 у Майкопе створана абл. маст.-вытв. майстэрні Краснадарскага аддз. маст. фонду Расіі.

Музыка адыгейцаў мае шэраг самабытных адметных рысаў. У яе аснове дыятанічныя лады, 2-дольная метрыка, у архаічных жанрах — нерэгулярна пераменная метрыка, мноства трыёляў, сінкопаў і інш. Сярод песенных жанраў працоўныя і абрадавыя песні. Танцы: зафак, ісламей, зыгатлат, удж-турыту, удж-хурай, зекакаш. Сярод інструментаў: флейта камыль, гармонік пшынэ, драўляная трашчотка пхачыч, струнна-смычковы апешшын. Найб. вядомыя кампазітары: У.Тхабісімаў, А.Нехай, Г.Самогава, М.Бесіджаў, Г.Чыч, Дж.Натха, Ч. і В.Анзарокавы. У А. працуюць (1988): Ансамбль нар. танца (Майкоп), філармонія, муз.-пед. ф-т Адыгейскага пед. ін-та, вучылішча мастацтваў, муз. школы.




Вытокі тэатр. мастацтва А. ў стараж. нар. эпасе, жартоўных сцэнках, якія ўваходзілі ў бытавыя, святочныя і працоўныя абрады. Першы нац. тэатр. калектыў — Адыгейскі абл. калгасна-саўгасны тэатр (1936). У 1941 у Майкопе створаны абл. драм. т-р імя А.С.Пушкіна (рус. і адыгейская трупы). У рэпертуары п'есы нац., рус., замежных драматургаў.

**АДЫ́ГІ**, агульная назва шматлікай у мінулым групы роднасных плямёнаў Паўн. Каўказа. У старажытнасці жылі на Пд3 Паўн. Каўказа і Чарнаморскім узбярэжжы. У ант. і пазнейшых крыніцах вядомы пад зборнымі імёнамі меоты (прыкубанскія плямёны), зіхі, керкеты (прычарнаморскія). У 5—10 ст. існаваў саюз А. на чале з зіхамі. З часоў манг. нашэсця (13 ст.) за А. замацавалася назва чэркесы. У 13—14 ст. частка А. прасунулася на У у бас. р. Церак і змяшалася з рэшткамі *аланаў*. На гэтай аснове ўтварылася кабардзінская народнасць. З сучасных народаў Каўказа да А. адносяцца таксама *адыгейцы* і *чэркесы*.

**А́ДЫДЖЭ** (Adige), рака на Пн Італіі. Даўж. 410 км, пл. бас. 14,7 тыс. км², большая ч. — у Альпах. Пачынаецца на З Эцтальскіх Альпаў, да г. Верона цячэ ў трогавай даліне, у ніжнім цячэнні — па Паданскай раўніне. Упадае ў Адрыятычнае м., утвараючы агульную дэльту з р. По. Паводкі вясной і восенню. Сярэдні расход вады 266 м³/сек. Суднаходная ў ніжнім цячэнні. ГЭС. На рацэ г. Верона.

**АДЫНАМІ́Я** (ад грэч. adynamia бяссілле), амаль поўнае або поўнае спыненне рухальнай актыўнасці ў выніку парушэнняў нервова-мышачнага апарата; крайні выпадак *гіпадынаміі*. Узнікае пры захворваннях цэнтр. і перыферычнай нерв. сістэмы, рэзкім упадку сіл пры галаданні, вымушанай поўнай мышачнай бяздзейнасці (напр., пры ложкавым рэжыме хворага), цяжкіх інфекц. захворваннях, хранічнай інтаксікацыі. Вядзе да атрафіі мышцаў, дэтрэніраванасці сардэчна-лёгачнай сістэмы, пагаршэння дзейнасці ўнутр. органаў, дысгармоніі вышэйшых вегетатыўных цэнтраў. Пры гэтым узнікаюць расстройствы эмацыянальныя і паводзін, галаўны боль, парушаецца сон, зніжаюцца рэзервовыя магчымасці арганізма.

**АДЫНЕ́Ц** Антон Эдвард (25.1.1804, в. Гейстуны Ашмянскага р-на Гродзенскай вобл. — 15.1.1885), польскі паэт, перакладчык, мемуарыст, выдавец. З роду *Адынцоў*. Скончыў Віленскі ун-т (1823). У Вільні пасябраваў з А.Міцкевічам, Я.Чачотам, Т.Занам, І.Дамейкам, І.Ходзькам. У 1821 стаў чл. т-ва *філарэтаў*, напісаў «Песню філарэтаў» (пераробка яе — «Песня» Ф.Багушэвіча). У 1823—24 зняволены па справе т-ва. У 1825—26 выдаў у Вільні 2-томнік «Паэтычныя творы». У 1829—37 падарожнічаў па Зах. Еўропе, жыў у Дрэздэне. З 1838 у Вільні. У 1841—59 рэдактар газ. «Виленский вестник». З 1866 у Варшаве. У 1888 з І.Дамейкам наведаў Беларусь. Аўтар мемуарных «Пісем з падарожжа» (1875—78), «Успамінаў з мінулага» (1884), вершаваных драм «Феліцыта, або Карфагенскія мучанікі» (1849), «Барбара Радзівілянка» (1860).

*Літ.*: Цвірка К. Тэлемак з-пад Ашмянаў: Жыццё і творчасць А.Э.Адынца // Роднае слова. 1994. № 3. *А.В.Мальдзіс.*

**АДЫНЦЫ́**, шляхецкі род герба «Адынец» у ВКЛ.

Найб. вядомыя: Марцін, сын Яна, скарбнік смаленскі (1745). Тадэвуш (1781—1833), сын Станіслава. Адвакат пры Гал. трыбунале ВКЛ. У 1800 набыў Гейстуны (Ашмянскі пав.), віцэ-маршалак гэтага павета. Меў 7 дзяцей, сярод іх пісьменнік А. *Адынец*. Верагодна, да гэтага роду належаў Вінцэнт Адынец (1865—1952) з сям'і шляхціца ў Ліцвінаве пад Мінскам. Генерал рус. арміі, удзельнічаў у рус.-японскай вайне 1904—05. Служыў у Першым Польскім корпусе, Бел.-Літ. дывізіі.

*Р.В.Баравы, Л.Л.Чарняўская.*

**АДЫПІ́НАВАЯ КІСЛАТА́**, арганічнае злучэнне з ліку *карбонавых кіслот* HOOC $(CH_2)_4$COOH. Мал. м. 146,14. Бясколерныя крышталі, t пл. 153 °С, узганяюцца, растваральныя ў вадзе і спіртах. Утварае солі — адыпінаты. Атрымліваюць двухстадыйным акісленнем цыклагексану. Выкарыстоўваецца ў вытв-сці нейлону, інсектыцыдаў, змазак, яе эфіры — пластыфікатары.

**АДЫРО́НДАК** (Adirondack), горны масіў у сістэме Апалачаў, у ЗША. Выш. да 1628 м (г. Марсі). Рэльеф сярэднягорны са згладжанымі ледавіковымі формамі. Складзены з крышт. пародаў. Шмат азёраў, горных рэк. На схілах хваёвыя і мяшаныя лясы. Раён турызму. Курорт Лейк-Плэсід, цэнтр Зімовых Алімпійскіх гульняў (1932, 1980).

**АДЫРХА́ЕВА** Святлана Дзантэміраўна (н. 12.5.1938, с. Хумалаг, Паўн. Асецыя), расійская артыстка балета. Нар. арт. Расіі (1974). Нар. арт. СССР (1984). Скончыла Ленінградскае харэагр. вучылішча (1955). Працавала ў Чэлябінску, Адэсе. З 1960 салістка Вял. т-ра ў Маскве. Сярод партый: Адэта—Адылія («Лебядзінае возера» П.Чайкоўскага), Мехменэ Бану («Легенда аб каханні» А.Мелікава), Эгіна («Спартак» А.Хачатурана), Зарэма («Бахчысарайскі фантан» Б.Асаф'ева), Кітры («Дон Кіхот» Л.Мінкуса).

**АДЫ́С-АБЕ́БА** (па-амхарску новая кветка), горад, сталіца *Эфіопіі*, адм. ц. правінцыі Шоа. Знаходзіцца на Эфіопскім нагор'і на выш. больш за 2,4 тыс. м над узр. мора. Больш за 1,5 млн. ж. (1993).

Засн. ў 1887 імператарам Мэнелікам II. У 1889 абвешчана сталіцай. Пасля перамогі ў італа-эфіопскай вайне 26.10.1896 тут заключаны мірны дагавор, паводле якога Італія прызнала незалежнасць Эфіопіі. 5.5.1936 акупіравана італьян. войскамі, вызвалена 6.4.1941 англа-эфіопскімі войскамі.

Аўтамаб. дарогі звязваюць А.-А. з буйнейшымі гарадамі Эфіопіі і суседніх краін. Чыгунка на Джыбуці. Міжнар. аэрапорт. Металаапр. і зборачныя з-ды (зборка трактароў, с.-г. машын, аўтамабіляў, веласіпедаў і інш.). Тэкст., гарбарна-абутковыя, мукамольныя, алейныя, па перапрацоўцы кавы, дрэваапр., мясамалочныя прадпрыемствы. Вытворчасць буд. матэрыялаў і саматужных ткацкіх, гарбарных, керамічных, метал. і драўляных вырабаў. Гандаль кавай, скурамі, збожжам і інш. Ун-т. Рэзідэнцыі Эканам. камісіі ААН для Афрыкі і Арганізацыі афр. адзінства (ААА).

Першыя манум. мураваныя будынкі ўзведзены замежнымі архітэктарамі. Вялікі палац з рысамі інд. архітэктуры (1894), Новы палац і сабор св. Георгія (абодва пач. 20 ст.) у стылі неакласіцызму, шпіталь Мэнеліка II (1910), атэль «Ытэге» (1907), каля 200 жылых дамоў еўрап. тыпу (1912). У 1950—60-я г. пабудаваны Нац. Тэатр на пл. Адуа (франц. арх. А.Шамет); універсітэцкі комплекс (англ. арх. Г.К.Фалек); аэрапорт, Дом Афрыкі (вітраж пл. 150 м², мастак А.Тэкле), муніцыпалітэт, Нац. банк (усе італьян. арх. А.Медзэдымі, інж. М.Фанана); тэлевіз. цэнтр, Гандл. палата, Мін-ва замежных спраў (арх. З.Энаў, М.Тэдрас). У 1970—80-я г. па праектах югасл. архітэктараў пабудаваны паштамт, шпіталь, атэль «Вебі-Шэбелі». Музеі: Археал., Ін-та эфіопскіх даследаванняў, Нацыянальны.

**АДЫСЕ́Й**, Улісс, у грэч. міфалогіі цар вострава Ітака, гал. герой паэмы «*Адысея*». Праславіўся як удзельнік *Траянскай вайны*. Вызначаўся адвагай, хітрасцю, розумам. Існуюць 2 версіі смерці А.: паводле адной яго смяротна параніў сын Тэлегон, па другой А. памёр у Этоліі ці Эпіры, дзе шанаваўся як герой, надзелены дарам прароцтва. Прыгоды А. адлюстраваны ў л-ры (Гамер, Сафокл, Эўрыпід і інш.) і выяўл. мастацтве (малюнкі на ант. вазах, фрэскі ў Пампеі і інш.).

**«АДЫСЕ́Я»**, старажытна-грэчаская эпічная паэма, якую разам з «Іліядай» (створана раней за «А.») прыпісваюць *Гамеру*. Напісана гекзаметрам, пазнейшымі ант. выдаўцамі падзелена на 24

Галава Адысея. Фрагмент скульптурнай групы з грота ў Сперлонгу. Канец 2 ст. да н.э.

кнігі. Апавядае пра падарожжы і прыгоды *Адысея*. У аснове «А.» сусв. вядомы фальклр. сюжэт: муж (Адысей) пасля доўгіх блуканняў вяртаецца непазнавальны да дня новага вяселля сваёй жонкі (*Пенелопы*). У адрозненне ад ваенна-гераічнай тэматыкі «Іліяды» «А.» мае ў асн. бытавы і казачны матэрыял. У вобразе Адысея вылучаюцца разумовыя і маральныя якасці, хітрая вынаходлівасць і разлік.

**АДЫСО́НАВА ХВАРО́БА**, бронзавая хвароба, хвароба, абумоўленая двухбаковым пашкоджаннем кары надныračнікаў, зніжэннем утварэння гармонаў (картызону, альдастэрону). Названа па прозвішчы англ. ўрача Т.Адысана, які ўпершыню яе апісаў (1849). Развіваецца марудна, часцей у 30—50 гадоў, пры пашкоджанні надныračнікаў туберкулёзам, амілаідозам, пры кровазліцці, пухлінах і метастазах у надныračнікі, аўтаімунных пашкоджаннях. Бываюць сямейныя (спадчынныя) формы. Характарызуюцца адынаміяй, агульнай слабасцю, павышанай стамляльнасцю, пахудзеннем, а таксама зніжэннем памяці, аблысеннем, паніжэннем т-ры, гіпатаніяй, парушэннем менструальнага цыкла, зніжэннем патэнцыі, узроўню натрыю і хларыдаў у крыві, павышанай колькасцю калію. Асноўная прыкмета хваробы — гіперпігментацыя скуры (цёмная, бронзавая афарбоўка, колер загару). Сустракаюцца атыпічныя (сцёртыя) формы А.х. без бронзавай афарбоўкі скуры. Лячэнне індывідуальнае (гарманальнае, дыета, вітаміны, процітуберкулёзныя сродкі).

**АДЫТЫ́ЎНАСЦЬ** (ад лац. additivus які прыбаўляецца), уласцівасць велічыні, значэнне якой адпаведнае цэламу аб'екту, роўна суме значэнняў велічыняў, адпаведных яго часткам, пры адвольнай разбіўцы аб'екта на часткі. Напр., А.

Адыс-Абеба. Адна з цэнтральных вуліц.

аб'ёму азначае, што аб'ём цэлага цела роўны суме аб'ёмаў яго частак.

**АДЫТЫ́ЎНАЯ ТЭО́РЫЯ ЛІ́КАЎ**, раздзел *лікаў тэорыі*, які ахоплівае пытанні раскладання натуральных лікаў на складаемыя пэўнага выгляду, а таксама іх алг. і геам. аналагі. Напр., задача пра запіс лікаў у выглядзе пэўнай сумы n-х ступеняў: сумы 4 квадратаў, 9 кубаў (гл.зв. Варынга праблемы), а таксама ў выглядзе сумы простых лікаў (гл. *Гольдбаха праблема*). Існуюць аналітычныя, алг., імавернасныя, элементарныя метады А.т.л. Шырока выкарыстоўваецца ў камбінаторным аналізе, лінейным праграмаванні і інш.

*В.І.Бернік.*

**АДЫХО́ДНІЦТВА**, часовы адыход сялян з вёсак у гарады на прамысл. прадпрыемствы, с.-г. работы свайго і інш. рэгіёнаў краіны, а таксама за мяжу. Уласціва большасці еўрапейскіх краін, пачынаючы з перыяду позняга феадалізму. Выклікана ўзмацненнем феад. эксплуатацыі, павышэннем ролі грашовага аброку, развіццём таварнай гаспадаркі і ростам попыту на наёмную працу. У Рас. імперыі А. дасягнула вял. памераў з 2-й пал. 18 ст., асабліва ў Цэнтр. прамысл. раёне. На Беларусі ў 1-й пал. 19 ст. значная колькасць сялян ішла на сплаўныя, возніцкія, дарожнабуд. і інш. работы. Пасля сял. рэформы 1861 А. набыло масавы характар. У канцы 19 ст. на Беларусі штогод у А. было каля 300 тыс. чал. Найб. пашырэнне яно атрымала ў Віцебскай і Магілёўскай губ. З Беларусі адыходнікі ішлі пераважна на заробкі ў інш. рэгіёны імперыі: на буд-ва дарог і чыгунак, на прадпрыемствы Пецярбурга, Масквы, Кіева, Рыгі, шахты і руднікі Данбаса і Крывога Рога, на с.-г. работы на Украіне і інш. У 1880-я г. пачалося А. ў Амерыку, напярэдадні 1-й сусв. вайны — у Прусію.

*В.П.Панюціч.*

**АДЫ́ЧНАЯ СТРАФА́**, від 10-радковай *страфы*. Ужывалася ў паэзіі 16—17 ст. у Францыі, потым у Германіі і Расіі, дзе ў 18 ст. была традыцыйнай для ўрачыстых одаў. А.с. аб'ядноўвала 4- і 6-радкоўе па схеме АбАбВВгдДг, пісалася 4-стопным *ямбам* з пэўным чаргаваннем рыфмаў.

**АДЫЯБА́ТНЫ ПРАЦЭ́С** (ад грэч. adiabatos неператходны, запёрты), тэрмадынамічны працэс, які адбываецца без цеплаабмену паміж тэрмадынамічнай сістэмай і навакольным асяроддзем. Працякае ў сістэме з цеплаізалявальнай (адыябатнай) абалонкай ці без яе пры ўмове, што працэс працякае настолькі хутка, што цеплаабмен можна не ўлічваць (напр., пры выбуху, распаўсюджванні гуку). А.п. лічацца многія атм. працэсы (напр., узыходны і сыходны рух паветра ў антыцыклонах і інш.).

На дыяграме адлюстроўваецца крывой — адыябатай, якая мае найб. просты выгляд для ідэальных газаў (гл. рыс.) і падпарадкоўваецца ўраўненню $pv^{\gamma} = \text{const}$, дзе p — ціск газу, v — яго аб'ём, $\gamma = C_p/C_v$ — паказчык адыябаты, $C_p$ і $C_v$ — цеплаёмістасці газу пры ізабарным і ізахорным працэсах адпаведна.




**Адыябатны працэс**: адыябата ідэальнага газу.

**АДЫЯ́НТУМ** (Adiantum), род папарацяў сям. адыянтавых. Каля 200 відаў, пашыраных у цяністых вільготных лясах трапічных (найб. разнастайнасць відаў у Паўд. Амерыцы), субтрапічных, радзей умераных паясоў амаль усяго зямнога шара. Растуць на зямлі або на скалах. На Беларусі вырошчваюць у аранжарэях і пакоях як дэкар. расліну А. венерын волас (A. capillus veneris).

Лісце звычайна бліскучае, цёмнае і пругкае, перыстае, на доўгіх цёмна-бурых чаранках, асаблівасць іх — воданепранікальнасць. Карэнішча тонкае, паўзучае, укрытае вузкімі карычняватымі лускавінкамі. Размнажаюцца спорамі і дзяленнем кустоў.

**Адыянтум венерын волас.**

**АДЭКАЛО́Н** (ад франц. eau de Cologne літар. кёльнская вада), парфумерны спіртаводны раствор *пахучых рэчываў*. Упершыню састаўлены на аснове цытрусавых алеяў: апельсінавага, мандарынавага, лімоннага і бергамотавага (1720-я г.). Гл. таксама *Духі*.

**АДЭКВА́ТНАЕ** (ад лац. adaequatus роўны, прыраўнаваны), адпаведнае, тоеснае, эквівалентнае. У тэорыі пазнання А. лічацца вобраз, веды, якія адпавядаюць свайму аб'екту і таму з'яўляюцца дакладнымі, маюць характар аб'ектыўных *ісцін*. Пытанне пра ступень адэкватнасці (дакладнасці), глыбіню і паўнату адлюстравання аб'екта звязана з праблемай суадносін адноснай і абсалютнай ісцін і крытэрыю ісціннасці ведаў.

**АДЭЛАІ́ДА** (Adelaide), горад на Пд Аўстраліі. Адм. ц. штата Паўд. Аўстралія. Знаходзіцца на ўзгорыстых берагах заліва Сент-Вінсент каля падножжа хр. Маўнт-Лофты. Засн. ў 1836. Больш за 1 млн. ж. (1993). Порт па вывазе с.-г. і харч. тавараў (пшаніца, воўна, віно і інш.). Вузел чыгунак і аўтадарог.

Буйны прамысл. цэнтр: аўтабудаванне, хім., электратэхн., электронная, металаапр. (у т.л. дакладная механіка), нафтаперапр. прам-сць. Цэнтр мукамольнай, вінаробнай, кансервавай, тэкст., швейнай, абутковай прам-сці. Выт-сць спажывецкіх тавараў. Ун-т.

**АДЭ́ЛІ ЗЯМЛЯ́** (Terre Adélie), частка тэрыторыі Усх. Антарктыды паміж 136° і 142° усх. даўгаты, абмываецца на Пн морам Дзюрвіля. Ледавіковае покрыва таўшчынёй да 2000 м, каля берага трапляюцца ўчасткі, свабодныя ад лёду. Клімат суровы, з перавагай штармавых вятроў. Адкрыта ў 1840 франц. экспедыцыяй пад кіраўніцтвам Ж.Дзюмон-Дзюрвіля, названа ў гонар яго жонкі. З 1956 паблізу берага А.з. (на в-ве Пятрэль) працуе франц. навук. станцыя «Дзюмон-Дзюрвіль».

**АДЭЛЬСБЕ́РГ** (Adelsberg), карставая пячора ў Славеніі каля г. Постайна; гл. *Пастойнска-Яма*.

**АДЭ́ЛЬСК**, вёска ў Беларусі, у Гродзенскім р-не. Цэнтр сельсавета і калгаса «Пагранічны». За 24 км на Пд ад Гродна, 9 км ад шашы Гродна—Ваўкавыск. 837 ж., 283 двары (1994).

Вядома як мястэчка з 15 ст. З 1690 вёска ў Трокскім ваяв., належала *Гродзенскай эканоміі*. З 1808 заштатны горад Саколкаўскага пав. Гродзенскай губ. Жыхары займаліся вы-

рабам тканін, сельскай гаспадаркай, гандлем. У 1897 у А. 1462 ж. У 1921—39 у складзе Польшчы, вёска. З 1939 у БССР, з 1940 у Гродзенскім р-не.

Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Касцёл Ушэсця — помнік нар. дойлідства (1-я пал. 18 ст.).

**АДЭ́ЛЬСКІ** Эмануіл Хацкелевіч (4.1.1891, Кіеў — 22.5.1982), бел. вучоны ў галіне цеплагазабеспячэння і вентыляцыі. Д-р тэхн. н. (1950), праф. (1950). Засл. дз. нав. і тэхн. Беларусі (1949). Скончыў Кіеўскі політэхн. ін-т (1916). У 1929—76 у БПІ. Навук. працы па пытаннях гідрамеханікі патокаў, цепла- і масаабмену, разліку трубаправодаў.

*Тв.*: Газоснабжение. 2 изд. Мн., 1966; Гидравлический расчёт трубопроводов разного назначения. 2 изд. Мн., 1967.

**АДЭ́ЛЯ З УСТРО́НІ**, бел. паэтэса сярэдзіны 19 ст. Жыла ў фальварку Устронь Лідскага пав. У 1850 нап. бел. паэму «Мачаха» (апубл. 1993, рукапіс у б-цы Ягелонскага ун-та ў Кракаве). У творы адчуваецца ўплыў рамантызму, творча выкарыстаны нар.-песенныя матывы. «Мачаха» прасякнута любоўю да Наднёманскага краю, вызв.-патрыят. настроямі. Аўтар спачувае абяздоленай сіротцы, шчасцю якой перашкаджае злая мачаха. Сярод дзеючых асоб персаніфікаваныя сілы прыроды: злая бура, наднёманскі лес, «літоўчык»-Нёман, які абараняе смелага юнака-плыўца. Пісала вершы і на польск. мове. *А.В.Мальдзіс.*

**АДЭН...**, **АДЭНА...** [ад грэч. adēn (adenos) залоза], састаўная частка складаных слоў, якая абазначае: «які адносіцца да залоз, залозістай тканкі», «які адносіцца да лімфатычных вузлоў», «які адносіцца да адэноідаў», напр., *адэнавірусы*, *адэноіды*.

**А́ДЭН**, горад у Емене, адм. ц. мухафазы Адэн на Пд Аравійскага п-ва. 417 тыс. ж. (1987). Транзітны порт у Адэнскім зал. Аравійскага м. Міжнародны аэрапорт. Гал. прамысл. і гандл. цэнтр краіны. Нафтаперапрацоўка; тэкст., харч., металаапр., суднарамонтныя прадпрыемствы, вытв-сць будматэрыялаў. Гандаль нафтай і нафтапрадуктамі, рыбай, прадуктамі сельскай гаспадаркі (збожжа, бавоўна, тытунь, скуры).

Вядомы пад назвай Адана, ці Асана, са стараж. часоў. Уваходзіў у склад паўд.-аравійскіх і йеменскіх дзяржаў, у асобныя перыяды быў цэнтрам незалежных княстваў. У 16—18 ст. пад уладай йеменскіх імамаў і тур. пашоў. З 1839 англ. ваен.-марская база. У 1967—90 сталіца Нар. Дэмакр. Рэспублікі Емен.

**А́ДЭН**, каланіяльнае ўладанне Вялікабрытаніі на Пд Аравійскага п-ва ў 1839—1967; гл. *Емен*.

**АДЭНАВІ́РУСНЫЯ ХВАРО́БЫ**, група інфекцыйных захворванняў чалавека і жывёлы, выкліканых *адэнавірусамі*. Здольнасць адэнавірусаў размнажацца ў эпітэліяльных клетках дыхальных шляхоў, кан'юнктывы, кішэчніка і лімфоіднай тканкі абумоўлівае разнастайнасць клінічных прыкмет хваробы: востры катар верхніх дыхальных шляхоў, кан'юнктывіт, энтэракаліт. Найб. успрымальныя да інфекцыі дзеці. Ліхаманка пры захворванні працягваецца 5—7 дзён, катаральны стан — да 10—12 дзён. Ускладненні (атыт, ангіна, пнеўманія) узнікаюць пры далучэнні бактэрыяльнай інфекцыі.

**АДЭНАВІ́РУСЫ** (ад *адэна...* + *вірусы*), сямейства ДНК-змяшчальных вірусаў, якія выклікаюць у чалавека і жывёл *адэнавірусныя хваробы*. Маюць адзінкавую лінейную двухланцужковую малекулу ДНК. У заражаных клетках прыгнятаюць сінтэзы ДНК, РНК і бялкоў. Размнажаюцца ў клетачных ядрах назваючных. Распаўсюджваюцца без пераносчыкаў. Пашкоджваюць розныя органы млекакормячых (у т.л. чалавека), птушак; могуць выклікаць утварэнне пухлін.

**АДЭНАЗІНТРЫФАСФА́Т**, тое, што *адэназінтрыфосфарная кіслата*.

**АДЭНАЗІНТРЫФАСФАТА́ЗЫ**, ферменты, якія каталізуюць адшчапленне



Адэназінфосфарныя кіслоты.

астатку фосфарнай к-ты ад малекулы *адэназінтрыфосфарнай кіслаты*. Належаць да класа *гідралаз*. Пашыраны ў жывых клетках, асабліва ў іх мембранных структурах. Забяспечваюць вылучэнне і выкарыстанне энергіі макраэргічных сувязяў АТФ для забеспячэння розных працэсаў жыццядзейнасці. У раслін ёсць А., якія каталізуюць адшчапленне ад АТФ двух астаткаў фосфарнай к-ты. Знойдзены таксама А., пры ўдзеле якіх ажыццяўляецца гідроліз АТФ на адэназінмонафасфат і пірафасфат (АТФ-пірафасфатазы).

**АДЭНАЗІНТРЫФО́СФАРНАЯ КІСЛАТА́**, адэназінтрыфасфат (АТФ), *нуклеатыд*, які змяшчае *адэнін*, *рыбозу* і 3 астаткі фосфарнай к-ты. Універсальны пераносчык і асн. акумулятар хім. энергіі ў жывых клетках, іх гал. *макраэргічнае злучэнне*, на ўзроўні якога спалучаюцца ў адзіную сістэму працэсы *абмену энергіі*, яе выдзялення, назапашвання і спажывання. Служыць таксама субстратам для сінтэзу РНК, выконвае важныя функцыі ў працэсах *фотасінтэзу*.

У мышачнай і інш. тканках на долю А.к. прыпадае каля 75% колькасці ўсіх адэназінфосфарных кіслот, пры гэтым большая частка свабоднай АТФ знаходзіцца ў комплексе з іонамі $Mg^{2+}$. Гідралітычнае адшчапленне астаткаў фосфарнай к-ты ад малекулы АТФ адбываецца пры ўдзеле *адэназінтрыфасфатазаў* з вылучэннем энергіі (каля 8,4 ккал/моль), якая выкарыстоўваецца на энергет. забеспячэнне біясінтэзу розных рэчываў, актыўны транспарт іонаў, мышачныя скарачэнні і інш. працэсы жыццядзейнасці. Сінтэзуецца АТФ з адэназіндыфасфату і неарган. фасфату (крыніцай для ўтварэння могуць быць таксама інш. багатыя энергіяй фасфаты клетак, напр. *крэацінфасфат*.) Поўнае і хуткае аднаўленне патрачанай у арганізме АТФ забяспечваецца расшчапленнем вугляводаў і інш. рэчываў.

**АДЭНАЗІНФО́СФАРНЫЯ КІСЛО́ТЫ**, адэназінфасфаты, складаныя арган. злучэнні (нуклеатыды), 5'-фосфарныя эфіры адэназіну. Маюць у сабе *адэнін*, *рыбозу* і 1 (адэназінмонафосфарная — адэнілавая к-та, АМФ; вядома таксама яе цыклічная форма, гл. ў арт. *Цыклічныя нуклеатыды*), 2 (адэназіндыфосфарная к-та, АДФ) ці 3 (адэназінтрыфосфарная кіслата; АТФ) астаткі фосфарнай к-ты. Знаходзяцца ў клетках усіх жывёльных і раслінных арганізмаў у сумарнай канцэнтрацыі 2—15 мМ (каля 87% усяго фонду свабодных нуклеатыдаў). Утвараюць адэнілавую сістэму, якой належыць адно з цэнтр. месцаў у абмене рэчываў і энергіі, пры гэтым пара АДФ/АТФ служыць асн. звяном перадачы энергіі ў клетках: пры пераносе фасфарыльных груп на АМФ, АДФ энергія ў арганізме акумулюецца, пры адшчапленні — вылучаецца.

Адэназінмонафасфат існуе ў свабоднай форме, уваходзіць у састаў РНК, многіх ферментаў, якія ўдзельнічаюць у пераносе вадароду і астаткаў фосфарнай к-ты. Знойдзены ў эрытрацытах крыві, мышцах, а таксама ў дражджах. Адэназіндыфасфат — прамежкавае злучэнне ў рэакцыях, якія звязаны з утварэннем і распадам АТФ, выконвае самастойную ролю ў рэгуляцыі працэсу «дыхання» *мітахондрый*. У жывых клетках знаходзіцца пераважна ў комплексе з іонамі $Mg^{2+}$. АДФ-глюкоза ўдзельнічае ў сінтэзе крухмалу. Штучныя прэпараты А.к. — іголкападобныя крышталі (АМФ, АТФ) або парашок (АДФ). Растворы дынатрыевай і монакальцыевай соляў АТФ выкарыстоўваюцца для ін'екцый пры мышачнай дыстрафіі, спазме сардэчных і перыферычных сасудаў. Прапісаказаны пры свежых інфарктах міякарду і запаленчых хваробах лёгкіх.

*Літ.*: Калинин Ф.Л., Лобов В.П., Жидков В.А. Справочник по биохимии. Киев, 1971; Ленинджер А. Биохимия: Пер. с англ. М., 1976; Основы биохимии: Пер. с англ. Т. 1—3. М., 1981; Справочник биохимика: Пер. с англ. М., 1991.

**АДЭНАКАРЦЫНО́МА** (ад *адэна...* + грэч. karkinōma пухліна), залозістая рак, злаякасная пухліна, якая можа развівацца з залозістага эпітэлію. Гісталагічна выяўляюцца ўнутрыклетачныя парушэнні ядзерна-плазматычных суадносін (павелічэнне ядра), полімарфізм клетак і інш. Характарызуецца інвазіўным ростам — за межы базальнай мембраны, без пэўнай мяжы. Найб.

частыя А. малочнай залозы, страўніка, кішэчніка. Лячэнне камбінаванае: хіміка-прамянёвая тэрапія і хірургічнае.

**АДЭНАМАТО́З ЛЁГКІХ** (ад *адэнома* + ... *оз*), хранічная вірусная хвароба жывёл. Характарызуецца развіццём шматлікіх залозападобных разрастанняў у лёгачнай парэнхіме. Пашырана амаль ва ўсіх краінах свету, адзначаецца і на Беларусі. Хварэюць авечкі, козы, менш

К.Адэнаўэр.

каровы, коні, сабакі, мышы, некаторыя рыбы. Узбуджальнік — рэтравірус тыпу С. Заражэнне паветрана-кропельным шляхам. Інкубацыйны перыяд ад некалькіх месяцаў да некалькіх гадоў. Лятальнасць ад 50 да 80%.

**АДЭНА́Т** (Odaenathus) Септымій (?—267), правіцель *Пальміры* ў 3 ст. н.э. У 260 нанёс паражэнне іранскаму цару Шапуру I. У 262—67 камандаваў пальмірскімі і рым. арміямі і атрымаў шэраг перамог над персамі, меў званне дукса і імператара. Фактычна быў незалежным ад Рыма правіцелем, прысвоіў сабе тытул «цара цароў».

**АДЭНА́ЎЭР** (Adenauer) Конрад (5.1.1876, Кёльн — 19.4.1967), дзяржаўны і палітычны дзеяч Германіі, першы федэральны канцлер ФРГ. Юрыст. У 1917—33 і маі—крас. 1945 обер-бургамістр г. Кёльн. У 1918—19 і 1923 выступаў за аддзяленне Рэйнскай правінцыі ад Прусіі і стварэнне Рэйнскай рэспублікі. У 1920—33 прэзідэнт прускага Дзярж. савета. Пры нацыянал-сацыялістах пазбаўлены пасады обер-бургамістра, у 1944 зняволены. З 1946 старшыня створанага ім *Хрысціянска-дэмакратычнага саюза* (ХДС) у брыт. акупац. зоне, у 1950—66 федэральны старшыня ХДС. У 1948—49 старшыня Парламенцкага савета. У 1949—63 федэральны канцлер, адначасова міністр замежных спраў (1951—55). Ва ўнутр. палітыцы прытрымліваўся прынцыпаў прававой дзяржавы. Урад А. падпісаў *Парыжскія пагадненні 1954*, ажыццявіў уступленне ФРГ у НАТО (1955), устанавіў дыпламат. адносіны з СССР (1955).

**АДЭНІ́ЛАВАЯ КІСЛАТА́**, гл. ў арт. *Адэназінфосфарныя кіслоты*.

**АДЭНІ́Н**, 6-амінапурын, $C_5H_5N_5$, арганічнае злучэнне, адна з пурынавых



асноў. Белы дробнакрышталічны парашок без паху, вострасалёнага смаку. Дрэнна растваральны ў вадзе, добра — у к-тах і шчолачах; здольны да моцнага паглынання ў ультрафіялетавай вобласці спектра. Ёсць ва ўсіх жывых раслінных і жывёльных клетках у складзе адэназіну, *адэназінфосфарных кіслот*, *нуклеінавых кіслот*, а таксама некаторых *ферментаў*. У арганізме акісляецца ў мачавую к-ту.

**АДЭНО́ІДЫ** (ад *адэна*... + грэч. eidos падобны), пухлінападобныя разрастанні насаглотачнай мандаліны. Бываюць пераважна ў дзяцей, часцей у 3—10 гадоў, іншы раз у грудных. Узнікненню А. спрыяюць інфекц. хваробы. Асн. прыкмета захворвання — цяжкае дыханне праз нос; часта праяўляецца захворваннямі сярэдняга вуха, «адэноідным габітусам» (вузкі нос, адкрыты рот, згладжаная носагубная складка, высокае паднябенне, няправільнае размяшчэнне зубоў на верхняй сківіцы), паслабленнем увагі і памяці, парушэннем сну, іншы раз начным нетрыманнем мачы. Лячэнне хірургічнае (выдаленне мандалін, часцей амбулаторна).

**АДЭНО́МА** (ад *адэн*... + ... *ома*), дабраякасная пухліна, якая можа развіцца з залозістага эпітэлію і захаваць структурныя прыкметы зыходнай тканкі. Развіваецца ў тканках малочнай, шчытападобнай, прастаты, гіпофіза і інш. залоз, а таксама ў залозістым эпітэліі слізістых абалонак страўніка, кішэчніка і інш. Часам перараджаецца ў злаякасную пухліну. Лячэнне хірургічнае.

**АДЭНО́МА ПРАСТА́ТЫ**, дабраякаснае пухлінападобнае разрастанне *прастаты*. Назіраецца ў мужчын часцей пасля 50 гадоў. У развіцці адрозніваюць стадыі: перадклінічная, дызурыі (парушэнне мочаспускання), няпоўнай хранічнай затрымкі мачы, парадаксальнай затрымкі мачы. Ускладненні пры А.п.: вострая затрымка мачы, цыстыт, піелонефрыт і інш. Лячэнне на першых дзвюх стадыях кансерватыўнае (гігіенічны рэжым, дыета, медыкаментознае лячэнне, мясцовыя фізіяпрацэдуры), пасля — аперацыйнае.

**АДЭ́НСКІ** (сапр. Пінчук) Андрэй Дзмітрыевіч (13.12.1897, г.п. Лоеў — 14.8.1979), бел. тэрапеўт. Д-р мед. н. (1943), праф. (1945). Засл. дз. нав. Беларусі (1967). Скончыў Кіеўскі ун-т (1927). З 1937 у Кіеўскім стаматалагічным ін-це, у 1949—70 у Бел. ін-це ўдасканалення ўрачоў. Працы па даследаванні вянознага ціску і яго ролі ў клініцы сардэчна-сасудзістых хвароб.

*Тв.*: Спутник терапевта. Т. 1—[2]. Мн., 1959—64.

**А́ДЭНСКІ ЗАЛІ́Ў**, у Аравійскім м., паміж п-вамі Аравійскім і Самалі. Бабэль-Мандэбскім пралівам злучаецца з Чырвоным м. Даўж. каля 900 км, шыр. да 300 км, глыб. да 4525 м. Рэльеф дна рэзка расчлянёны. Характэрна інтэнсіўнае свячэнне вады на паверхні заліва. Прылівы паўсутачныя, выш. да 2,9 м. Гал. порт — г. *Адэн*.

**АДЭ́СА**, горад на Украіне, цэнтр *Адэскай вобласці* 1086,7 тыс. ж. (1993). Буйны міжнар. порт на Чорным моры. Чыг. вузел. Прамысловасць: машынабудаванне і металаапрацоўка (станкі, с.-г. машыны, цяжкія краны, вытв-сць халадзільнага, мед., гандл., паліграф. абсталявання), хім. (суперфасфат, лакі і фарбы), нафтаперапр., хім.-фармацэўтычная, харч. (цукрова-рафінадная, алейна-тлушчавая, кансервавая, вінаробная і інш.), лёгкая (джутавая, футравая, тэкст., абутковая і інш.).

На тэр. сучаснай А. паселішча і гарадзішча існавалі да н.э. У час Кіеўскай Русі тут жылі ўсх.-слав. плямёны улічаў і цівердаў. У 1239—40 паселішча захоплена мангола-татарамі. З пач. 15 ст. ў складзе ВКЛ. Пад назвай Хаджыбей упамінаецца ў 1415. У 1764 туркі пабудавалі тут крэпасць Ені-Дунья (Новы свет), якая паводле *Яскага мірнага дагавора 1791* адышла да Расіі. У 1795 Хаджыбей перайменаваны ў А. З 1805 А. — адм. ц. Новарасійскага краю, з 1825 цэнтр павета Херсонскай губ. З 1932 цэнтр Адэскай вобл. У 1817 засн. ліцэй (гл. *Адэскі універсітэт*), у 1825 гіст.-археал. музей, у 1830 публічная б-ка. За гераізм у Вял. Айч. вайну (гл. *Адэсы абарона 1841, Адэская аперацыя 1944*) прысвоена званне горада-героя (1945).

У 1917 у А. і Адэскай акр. знаходзілася больш за 100 тыс. беларусаў з мясц. насельніцтва, бежанцаў 1-й сусв. вайны і салдат Румынскага фронту. У 1917—20 тут дзейнічалі арг-цыі *«Беларускі гай»*, Бел. вайсковая рада, Бел. нац. рада і абраны ёю Бел. нац. камісарыят, выходзіла газ. «Белорусы в Одессе». Сярод актыўных чл. гэтых арг-цый бел. дзеячы А.Ф.Адамовіч, А.В.Баліцкі, П.В.Ільюнак, С.М.Некрашэвіч і інш.

У аснове рэгулярнага плана А. 1794 (інж. Ф.Дэвалан) 3 восевыя магістралі, якія выходзяць да Прыморскага бульвара, забудаваныя ў стылі класіцызму. Цэнтр. ансамбль — паўкруглая плошча з помнікам А.Э.Рышэлье (1828, скульпт. І.Мартас); ад плошчы да мора вядзе манум. Пацёмкінская лесвіца (1841, арх. Ф.К.Бофа). У 1884—87 узведзены будынак тэатра оперы і балета (арх. Ф.Фельнер і Г.Гельмер). У А. працавалі арх. А.Мельнікаў, А.Бернардацы, Тама дэ Тамон і інш. Сярод арх. помнікаў: палацы Патоцкага (1805—10, цяпер Маст. музей), Гагарыных (1842, цяпер Літ. музей), Новая біржа (1894—99, цяпер філармонія), пасаж (1899—1903). А. забудоўваецца паводле ген.

плана 1966. Пабудаваны марскі вакзал (1966), гасцініца «Чорнае мора» (1972), Палац спорту (1976), Тэатр муз. камедыі (1981) і інш. Музеі: Археал., Мастацкі, Літаратурны, Зах. і ўсх. мастацтваў; *Адэскі універсітэт*, мед., пед., політэхн., інжынераў марскога флоту ін-ты і інш. У А. буйны турысцкі цэнтр, пункт марскіх круізаў (у т.л. замежных), турысцкі комплекс «Адэса» на курорце *Аркадзія*.

**АДЭ́СКАЯ АПЕРА́ЦЫЯ 1944**, баявыя дзеянні войскаў 3-га Укр. фронту (ген. арміі Р.Я.Маліноўскі) ва ўзаемадзеянні з Чарнаморскім флотам (адм. П.С.Акцябрскі) 26 сак. — 14 крас. з мэтай разгрому 6-й ням. і 3-й рум. армій групы армій «А» і вызвалення Адэсы ў Вял. Айч. вайну. Поспеху аперацыі садзейнічалі войскі 2-га Укр. фронту, якія ў канцы сак. фарсіравалі р. Прут і выйшлі на подступы да Ясаў, скаваўшы паўд. групоўку праціўніка. На левым крыле фронту ўдар у напрамку Мікалаева нанеслі 5-я ўдарная і 28-я арміі, 28 сак. горад быў вызвалены. Прарыў абароны на флангах і пагроза акружэння прымусілі праціўніка адысходзіць за р. Днестр. На левым крыле фронту часці 28-й арміі з дапамогай марскога дэсанта авалодалі Ачакавам і пачалі наступленне на Адэсу. 4 крас. 37-я армія і конна-механізаваная група ген. І.А.Пліева авалодалі чыг. вузлом Раздзельная. 9 крас. сав. войскі ўварваліся ў паўн. кварталы Адэсы і начным штурмам да раніцы 10 крас. вызвалілі горад. Войскі 3-га Укр. фронту 12 крас. вызвалілі Цірaспаль, 14 крас. авалодалі плацдармам на зах. беразе р. Днестр.

**АДЭ́СКАЯ ВО́БЛАСЦЬ**, на ПдЗ Украіны. Утворана 27.2.1932. Пл. 33,3 тыс. км². Нас. 2639 тыс. чал. (1993), гарадскога 66%. Цэнтр — г. *Адэса*. Найб. гарады: Ізмаіл, Белгарад-Днястроўскі, Катоўск.

Прырода. Большая ч. тэр. — Прычарнаморская нізіна, паўн. ч. — Падольскае ўзв. (выш. да 220 м), паміж Днестром і Прутам адгор'і Малдаўскага ўзв. (выш. да 223 м). Карысныя выкапні — буд. матэрыялы: гнейсы, граніты, вапнякі, гліны, пясок. Ёсць графіт, каменная соль, шмат мінер. крыніц. Клімат умерана кантынентальны, цёплы, з недастатковым увільгатненнем. Сярэдняя т-ра студз. ад -2 °С да -5 °С, ліп. ад 21 °С да 23 °С. Гадавая колькасць ападкаў каля 400 мм. Гал. рэкі: Дунай, Днестр. Прэсныя азёры Катул, Ялпуг, салёныя — Шаганы, Алібей, Бурнас. Глебы пераважна чарназёмныя, на Пд пераходзяць у цёмна-каштанавыя слабасаланцаватыя. Паўн. ч. знаходзіцца ў лесастэпавай, астатняя — у стэпавай прыроднай зоне, якая амаль поўнасцю ўзараная. Лясы захаваліся на невял. плошчах (дуб, граб, ясень, клён). Запаведнік Дунайскія Плаўні.

Гаспадарка. А.в. — высокаразвіты ў эканам. адносінах раён Украіны з машынабуд., хім., нафтахім., лёгкай, харч. прам-сцю, шматгаліновай сельскай гаспадаркай, рыбалоўствам, развітым транспартам і курортнымі зонамі. Машынабудаванне і металаапрацоўка (станкі, с.-г. машыны і прылады, пад'ёмныя транспарцёры; кавальска-прэсавае, гандл., мед., паліграф. абсталяванне; электратэхніка і кінаапаратура, выліч. машыны, кабель, прыладабудаванне, вытв-сць стальных канатаў), харч. (кансервавая, мукамольная, цукр., мясная, малочная, рыбная, вінаробная і інш.), камбікормавая, лёгкая (джутавая, футравая, тэкст., абутковая), хім. (аміяк, суперфасфат, лакі і фарбы), хім.-фармацэўтычная, мэблевая, цэлюлозна-папяровая прам-сць; вытв-сць буд. матэрыялаў. Развітая збожжавая гаспадарка (пшаніца, кукуруза, ячмень, рыс), вырошчванне тэхн. культур (цукр. буракоў, сланечніку), агародніны. Пладаводства. Вінаградарства. Мяса-малочная жывёлагадоўля, свінаводства, птушкагадоўля, рыбагадоўля. Буйныя арашальныя сістэмы. Суднаходства па Дунаі і Днестры. Марскія парты: Адэса, Ільічоўск, Ізмаіл і інш. Марскі чыг. паром Ільічоўск—Варна (Балгарыя). Чыгункі: Адэса—Масква, Адэса—С.-Пецярбург і інш., *Адэская група курортаў*.

**АДЭ́СКАЯ ГРУ́ПА КУРО́РТАЎ**, размешчана ўздоўж узбярэжжа Чорнага м., у межах Адэсы і на ПдЗ ад яе, а та-



Адэса. Тэатр оперы і балета.

Марскі вакзал у Адэсе.

ксама паблізу Куяльніцкага, Хаджыбейскага, Сухога ліманаў. Уключае курорты *Аркадзія*, *Вялікі Фантан*, *Куяльніцкі*, Лузанаўка, Лебедзеўка, Чарнаморка і інш., а таксама курортную мясцовасць Шабо. Асн. прыродныя лекавыя фактары — клімат, ліманныя і азёрныя гразі, рапа ліманаў, мінер. воды.

**АДЭ́СКІ УНІВЕРСІТЭ́Т** імя І.І.Мечнікава. Заснаваны ў 1865 у Адэсе на базе Рышэльеўскага ліцэя пад назваю Новарасійскі ун-т. У першыя гады сав. улады рэарганізаваны ў шэраг самастойных ВНУ. У 1933 адноўлены і названы Адэскім. Імя Мечнікава ун-ту прысвоена ў 1945. Факультэты: механіка-матэм., фіз., хім., біял., геолага-геагр., гіст., юрыд., філал. і рамана-герм. філалогіі. Навучанне дзённае, вячэрняе, завочнае; падрыхтоўчае аддзяленне. Аспірантура. Пры ун-це працуюць НДІ фізікі, астр. абсерваторыя, бат. сад, вылічальны цэнтр, б-ка і інш.

**АДЭ́СЫ АБАРО́НА 1941**, вялася войскамі Асобнай Прыморскай арміі (ген.-лейт. Г.П.Сафронаў, з 5 кастр. ген.-м. І.Я.Пятроў), сіламі Адэскай ваенна-марской базы (контр-адм. Г.В.Жукаў) і Чарнаморскага флоту (віцэ-адм. П.С.Акцябрскі) пры актыўным удзеле насельніцтва горада супраць войск 4-й рум. арміі (ген. Н.Чуперка) 5 жн. — 16 кастр. ў Вял. Айч вайну. З 5 жн. адрэзаная ад гал. сіл Паўд. фронту Асобная Прыморская армія (2 стралк. і кав. дывізіі) стрымлівала націск 5 пях., 2 кав. дывізій і матарызаванай брыгады 4-й рум. арміі на подступах да Адэсы. 13 жн. вораг выйшаў да ўзбярэжжа і поўнасцю блакіраваў горад з сушы. 19 жн. створаны Адэскі абарончы раён (узначаліў контр-адм. Жукаў), які меў 4 дывізіі супраць 14 (у вер. 17) дывізій і 2 брыгад праціўніка. З 20 жн. вяліся актыўныя баявыя дзеянні на апорных рубяжах шматпалоснай абарончай сістэмы, створанай насельніцтвам горада і войскамі, якія падтрымліваліся артыл. агнём караблёў Чарнаморскага флоту, 8 берагавых батарэй і авіяцыяй. 22 вер. 2 рум. дывізіі былі разбіты і праціўнік адкінуты на 5—8 км. 30 вер. ў сувязі з пагрозай прарыву ням. войскаў у Крым была арганізавана эвакуацыя войск Адэскага р-на на Крымскі п-аў. А.а. скавала 18 дывізій праціўніка, было выведзена са строю 20 самалётаў і каля 100 танкаў.

**АД'Ю́НКТ** (ад лац. adjunctus далучаны), 1) у некаторых краінах Зах. Еўропы і ў Расіі асоба, якая праходзіць навук. стажыроўку; памочнік кіраўніка кафедры, прафесара, акадэміка; малодшая навук. пасада. У АН, ун-тах, некат. ВНУ Расіі пасля ўвядзення Статута 1863 званне А. заменена на званне дацэнт. 2) У некаторых краінах СНД афіцэр, які займаецца ў *ад'юнктуры*.

**АД'ЮНКТУ́РА**, адна з асн. формаў падрыхтоўкі навук. і навукова-пед. кадраў у ВНУ і н.-д. установах Узбр. Сіл некаторых краін СНД. Засн. ў 1938. Камплектуецца з асоб афіцэрскага саставу. Падрыхтоўка прынятых у А. працягледжвае абарону дысертацыі на атрыманне вучонай ступені канд. навук па абранай спецыяльнасці. Аналагічная *аспірантуры* ў цывільных ВНУ.

**АД'ЮТА́НТ** [ад лац. adjutans (adjutantis) які дапамагае], 1) афіцэр (у арміях некат. дзяржаў таксама прапаршчык, мічман) пры начальніку для розных даручэнняў і дапамогі ў кіраўніцтве воінскімі падраздзяленнямі. 2) У дарэв. рус. арміі з 17 ст. пасада афіцэра, адказнага за справаводства ў штабах. 3) Прыдворны ваен. чын у свеце манарха (генерал-А., флігель-А.). 4) У Францыі ў 19 ст. афіцэр у палку, які адказваў за навучанне унтэр-афіцэраў і капралаў.

Аер балотны.

Ажгон.

**А́Е-А́Е**, гл. *Руканожка мадагаскарская*.

**АЕ́Р** (Acorus), род шматгадовых травяністых раслін сям. ароннікавых. 2 віды, пашыраныя ва ўмераных і субтрапічных зонах Еўразіі і Паўн. Амерыкі. На Беларусі А. звычайны (A. calamus; нар. назвы — ірны корань, шувар, касатар, явар, ярай, яір). Расце на балотах, водмелях рэк, азёр, сажалак, старыц, канаў. Радзіма Усх. Азія; у 13 ст. як лек. расліна завезена ў Польшчу, у 16 ст. яго пачалі разводзіць у Зах. Еўропе. А. злакавы, або акурус (A.gramineus), асабліва пашыраны ў Японіі, на Беларусі вядомы як акварыумная расліна.

Расліны А. звычайнага выш. 30—120 см, маюць характэрны пах. Сцябло прамое, лісце даўж. да 1 м. Карэнішча тоўстае, доўгае, з бародаўчатай паверхняй. Кветкі дробныя, зеленавата-жоўтыя, у цыліндрычных зялёных катахах даўж. 6—8 см. Плод — маланасенная сухая ягада. Размнажаецца пераважна дзяленнем карэнішча. Настой з яго ўжываецца для ўзбуджэння апетыту, як танізоўны сродак, прэпараты — пры лячэнні язвавай хваробы, гастрыту. Эфірны алей выкарыстоўваецца ў лікёра-гарэлачнай і кандытарскай вытв-сці, парфумерыі.

**АЖАРО́ЎСКІ** (Ożarowski, Ожаровский) Адам Пятровіч (1776, Варшава — 5.12.1855), расійскі ваенны і дзярж. дзеяч, граф. Ген. ад кавалерыі (1826). Сенатар (1826). Удзельнік вызв. паўстання 1794. З 1796 на рус. ваен. службе. Удзельнічаў у кампаніях 1805 і 1807 супраць Францыі. У вайну 1812 камандзір асобнага кав. атрада (6 палкоў) для партыз. дзеянняў на паўд. фланге праціўніка. Удзельнічаў у баях пад Красным (Смаленская вобл.), у занятці Магілёва, *Бярэзінскай аперацыі 1812*, у праследаванні французаў у напрамку Валожын—Воранава—Ліда—Ражанка. У замежных паходах рус. арміі (1812—14) узначальваў асобны кав. атрад. З 1814 у бліжэйшым акружэнні імператара Аляксандра I. З 1833 член Дзярж. савета Царства Польскага, з 1841 прысутны ў Варшаўскіх дэпартаментах Сената.

**А́ЖБЕ**, Ашбе (Ažbè) Антон (30.5.1862, г. Даленчыцэ, Славенія — 6.8.1905), славенскі жывапісец і педагог. Вучыўся ў Венскай і Мюнхенскай акадэміях мастацтваў. Творчасць пазначана пошукамі колеравай выразнасці, пераходам ад акадэмізму да пленэрнага жывапісу («Галава селяніна», каля 1890; «У гарэме», «Негрыцянка», абедзве каля 1895). У 1891 адкрыў у Мюнхене ўласную маст. студыю, дзе вучыліся В.Кандзінскі, А.Мурашка, І.Грабар.

**АЖГІРЭ́ВІЧ** Лідзія Фёдараўна (н. 1.1.1931, г. Петразаводск), бел. геолаг. Д-р геолага-мінер. н. (1989). Скончыла Далёкаўсходні політэхн. ін-т (1954; Уладзівасток). З 1965 на Беларусі, у Бел. н.-д. геолагаразведачным ін-це, з 1977 у Ін-це геал. навук АН Беларусі, з

1994 — у н.-д. прадпрыемстве «Белгеа». Навук. працы па петраграфіі каменнага і бурага вугалю, гаручых сланцаў, паходжанні і размяшчэнні карысных выкапняў, катагенезе, літолага-фацыяльным і фармацыйным аналізе асадкавых тоўшчаў фанеразою Беларусі і інш. рэгіёнаў.

*Тв.*: Буроугольная формация кайнозоя Белоруссии. Мн., 1981; Сланценосная формация верхнего палеозоя Белоруссии. Мн., 1982; Закономерности размещения и образования горючих ископаемых. Мн., 1986.

*Т.В.Якубоўская.*

**АЖГО́Н** (Trachyspermum ammi), аяван духмяны, індыйскі кмен, аднагадовая травяністая расліна сям. парасонавых; *эфіраалейная культура*. Пашырана ў Міжземнамор'і, Азіі, Паўд. Амерыцы.

Сцябло цыліндрычнае, баразнаватае, галінастае, выш. да 70—120 см. Лісце чаргаванае, да ўтварэння сцябла ў разетцы. Кветкі двухполыя, дробныя, белыя або фіялетавыя. Плады — двухсямянкі, маюць 2,5—10% эфірнага алею з тымолам (35—40%), які выкарыстоўваецца ў медыцыне, парфюмернай і харч. прам-сці. Свяглo- і вільгацелюбівая расліна. Лепшыя глебы — чарназёмы і шэразёмы цёмнага колеру. Размнажаюць насеннем.

**АЖУ́Р** (ад франц. à jour на гэты дзень), 1) вядзенне бухгалтарскага ўліку, пры якім усе рахунковыя запісы зроблены ў дзень завяршэння гасп. аперацый; у больш шырокім сэнсе — калі ўлікававыліч. работы выконваюцца ва ўстаноўленыя графікам тэрміны. 2) У ажуры (перан.) — у поўным парадку.

**АЖУ́Р** (ад франц. à jour скразны), 1) скразны разны, плецены *арнамент* у вязанні, вышыванні, разьбе, ювелірным вырабе, маст. ліцці і інш. 2) Тонкая карункавая тканіна.

**АЖЫ́НА**, маліна шызая (Rubus caesius), кустовая расліна сям. ружавых. Пашырана ў краінах Еўропы, Амерыкі, Афрыкі, Сярэдняй Азіі; на Беларусі ўсюды, асабліва на Палессі. Расце па берагах рэк, на заліўных лугах, узлесках, у хмызняках, утварае густыя, непраходныя зараснікі. Прыдатная для лесамеліярацыйных работ, замацавання яроў.

Кусты выш. 60—150 см. Надземныя парасткі двухгадовыя, фіялетава-шызыя, звычайна ўкрытыя шыпамі і шчацінкамі. Лісце няпарнаперыстараздзельнае з 3—5 лісцікамі. Кветкі двухполыя, белыя, дыям. да 3 см. Цвіце ў чэрв.—ліп., плады сакавітыя салодкія складаныя касцянкі, чорныя з шызым налётам, выспяваюць у сярэдзіне жніўня. У аматарскім садоўніцтве культывуецца сорт Агавам, найб. прыстасаваны да клімат. умоў Беларусі. З пладоў гатуюць сокі, варэнне, жэле, яны багатыя цукрамі, к-тамі, вітамінамі, карацінамі, танідамі.

**А́ЖЫО** (італьян. aggio), лаж, перавышэнне рыначнай цаны золата, курсу грашовых знакаў, вэксаляў і інш. каштоўных папер над іх намінальнай вартасцю. Вылічваецца ў працэнтах. Адхіленне курсу ад наміналу ў бок змяншэння наз. дызажыо.

**АЖЫЎЛЕ́ННЕ АРГАНІ́ЗМА**, гл. *Рэанімацыя.*

**АЖЭ́ХАВА**, возера ў Беларусі, у Браслаўскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Друйка. Пл. 0,64 км², даўж. 1,53 км, найб. шыр. 0,71 км, найб. глыб. 3,3 м, даўж. берагавой лініі 4,4 км. Пл. вадазбору 19,4 км². Схілы выш. ад 2 да 12 м. Берагі стромкія, на Пн зліваюцца са схіламі, параслі хмызняком, на З забалочаныя. Дно плоскае, сапрапелістае, каля барагоў пясчанае і пясчана-галечнае. Выцякае ручай у воз. Саванар.

**АЖЭ́ШКА** (Арэшка) Фларыян (Фларэнцый) Феліксавіч (1833, Кобрынскі пав. — 1905), удзельнік паўстання 1863—64 на Беларусі. З роду *Ажэшкаў*. Скончыў Пецярбургскую медыка-хірург. акадэмію (1861). Уваходзіў у Кобрынскую паўстанцкую арг-цыю. У крас. 1863 уступіў у атрад Р.*Траўгута*, удзельнічаў у баях. Пасля разгрому

Ажына.

атрада спрабаваў яго аднавіць. 5.7.1863 арыштаваны. У 1864 сасланы ў Томск. З 1878 23 гады працаваў урачом томскай турмы, потым урачом духоўнай семінарыі.

**АЖЭ́ШКА** (Orzeszkowa; дзявочае Паўлоўская) Эліза (6.6.1841, б. маёнтак Мількаўшчына, Гродзенскі р-н — 18.5.1910), польская пісьменніца. У фарміраванні яе светапогляду выключную ролю адыграді паўстанне 1863—64 і сялянскі рух 1860—80-х г. на Беларусі. Была звязана з дзеячамі славянскай культуры: Ф.Багушэвічам, І.Франко, М.Салтыковым-Шчадрыным і інш. Літ. дзейнасць пачала ў 1866 (апавяд. «Малюнак з галодных гадоў»). Творчасць 1870-х г. зведала ўплыў ідэй «варшаўскага» пазітывізму, асветнай працы з народам. Выступала за раўнапраўе жанчын (аповесці «Апошняе каханне», 1868, «Пан Граба», 1869—70, «Марта».

Э.Ажэшка.

1873), з крытыкай шляхецкай арыстакратыі і саслоўных прымхаў (раман «Пампалінскія», 1876), з гуманіст. пазіцый адстойвала інтарэсы працоўных (зб. апавяд. «З розных сфер», т. 1—3, 1879—82). У рамане «Над Нёманам» (1887) адлюстравала вострыя праблемы тагачаснай польскай рэчаіснасці. У аповесцях «Нізіны» (1884), «Дзюрдзі» (1885), «Хам» (1888), апавяданнях «Рэха», «Тадэвуш», «У зімовы вечар» і інш. паказала жыццё паслярэформенай бел. вёскі. Пра фальклор і духоўнае багацце беларусаў нарысы «Людзі і кветкі на берагах Нёмана» (1888—91). У 1890-я г. ў яе творах вастрыня сац. праблематыкі саступае месца псіхал. заглыбленасці («Два полюсы», 1893, зб. апавяд. «Меланхолікі», 1896). Апошні зб. навел «Gloria victis» («Слава пераможаным!», 1910) прысвечаны героям паўстання 1863—64. Інсцэніраваныя творы А. ставіліся Першай бел. трупай І.Буйніцкага («Хам», «У зімовы вечар», 1910—12), Бел. муз.-драм. гуртком у Вільні («Хам», 1913), Першым т-вам бел. драмы і камедыі («Хам», «У зімовы вечар», 1917), трупай У.Галубка («Рысь», 1923), Бел. дзярж. т-рам («У зімовы вечар», «Хам», 1920—21) і інш.; паводле аповесці «Хам» паст. аднайменны шматсерыйны тэлефільм (1990, рэж. Дз. Зайцаў; кінаварыянт пад назвай «Франка»). На бел. мову перакладзены творы А. «Гэдалі» (1907), «У зімовы вечар» (1927). Асобным выданнем выйшла яе кн. «Выбранае» (1975, пер. Я.Брыля і Я.Бяганскай). У Гродне ў 1929 пастаўлены помнік А., яе імем названа адна з гал. вуліц.

*Тв.*: Рус. пер. — Соч. Т. 1—5. М., 1953—54.

*Літ.*: Гапава В.І. Эліза Ажэшка: Жыццё і творчасць. Мн., 1969.

*В.І.Гапава.*

**АЖЭ́ШКІ**, Арэшкі, шляхецкі род герба «Побуг» у ВКЛ. Найб. вядомыя:

Людвік, падкаморы пінскі, удзельнік *Барскай канфедэрацыі*. Антоні (1743—71), сын Людвіка. Маршалак пінскі, удзельнік Барскай канфедэрацыі. Леапольд (каля 1720—79), стольнік (1748), пісар гродскі (1750) і суддзя земскі пінскі, падпалкоўнік войска літ. (1754).

Верагодна, да гэтай лініі А. адносіліся:

Антоні (1800—77), удзельнік паўстання 1830—31, адзін з арганізатараў паўстанцкіх атрадаў у Пінскім пав. У 1831 арыштаваны.

жыў пад наглядам паліцыі. У 1838 арыштаваны за сувязь з Ш.*Канарскім* і *Саюзам польскага народа*. Сасланы ў Томск на 20 гадоў. П ё т р , уладальнік маёнтка Людвінова Кобрынскага пав. У 1858 ажаніўся з будучай польскай пісьменніцай Паўлоўскай (гл. *Ажэшка* Эліза). Ф л а р ы я н , гл. *Ажэшка* Ф.Ф.

**АЗА...**, састаўная частка назвы рада хім. злучэнняў, у склад якіх уваходзіць азот, напр., *азазлучэнні*, *азафарбавальнікі*.

Т.Азах.

**АЗААСПЕРМІ́Я** (*а...* + *заа...* + грэч. sperma семя), адсутнасць у сперме сперматазоідаў пры наяўнасці іх папярэдніх формаў (клетак сперматагенезу, прадуктаў сакрэцыі прастаты і семявых пузыркоў); адна з прычын бясплоддзя ў мужчын. А. могуць выклікаць прыроджаныя (генет.) парушэнні, таксічныя ўздзеянні радыеактыўных і хім. рэчываў, хваробы палавых органаў.

**АЗАБЕНЗО́Л**, найпрасцейшае араматычнае *азазлучэнне*, $C_6H_5N = NC_6H_5$. Мал. м. 182,22, аранжава-чырв. крышталі, устойлівы транс-ізамер, t пл. 68 °С. Нерастваральны ў вадзе, растваральны ў арган. растваральніках. Атрымліваюць аднаўленнем нітрабензолу. Вытворныя А. — *азафарбавальнікі* і змякчальнікі для гумы.

**АЗАГЕ́НЫ**, рэчывы для халоднага фарбавання; прадукты, якія выкарыстоўваюцца для сінтэзу *азафарбавальнікаў* непасрэдна на валакністых матэрыялах. Найб. пашыраны азатолы і дыазолі.

А з а т о л ы — арыламіды шэрагу араматычных кіслот (напр., 3-гідраксі-2-нафтойнай кіслаты) ці β-*кетакіслот* (напр., ацэтаванетанай кіслаты) — крышталічныя рэчывы, нерастваральныя ў вадзе, пры награванні са шчолачамі ўтвараюць водарастваральныя солі. Д ы а з о л і — стойкія формы *дыазазлучэнняў*, пераважна двайныя солі з хлорыстым цынкам, араматычнымі сульфакіслотамі (крышталічныя рэчывы, растваральныя ў вадзе, пры награванні ці ўдары ўзгараюцца, пылапаветраныя сумесі іх выбухованебяспечныя). Для змяшэння небяспечных уласцівасцей дыазолі змешваюць з напаўняльнікамі (сернакіслымі солямі натрыю ці алюмінію).

А. змяшчаюцца на матэрыялах (цэлюлозных, поліамідных, поліэфірных, поліакрыламідных валокнах, тканінах, пражы) і пры адпаведнай апрацоўцы (гл. *Фарбаванне*) надаюць ім яркую і трывалую афарбоўку любога колеру. Выкарыстоўваюцца пры друкаванні на тканінах.

**АЗАДЗІ́** Даўлетмамед (1700—60), туркменскі паэт і вучоны. Бацька *Махтумкулі*. Прыхільнік містычнай плыні ў ісламе — *суфізму*. Займаўся тэорыяй верша. Асн. твор — дыдактычная паэма «Пропаведзь Азадзі» («Вагзі-Азад») — разважанні пра справядлівага правіцеля, маральна-этычныя нормы паводзін, развіццё гандлю і земляробства. Мова паэмы архаічная, насычаная арабаперсідскімі элементамі.

**АЗАДО́ЎСКІ** Марк Канстанцінавіч (18.12.1888, г. Іркуцк — 24.11.1954), рус. фалькларыст, этнограф, літ.-знавец. Скончыў Пецярбургскі ун-т (1913). Даследаваў праблемы казказнаўства, асобныя жанры фальклору («Ленскія галашэнні», 1922; «Верхняленскія казкі», 1938), сувязь вуснай нар. творчасці і л-ры («Руская казка», т. 1—2, 1932; «Артыкулы па літаратуры і фальклоры»,



Азакерыт.

1960, і інш.). Найб. значная праца «Гісторыя рускай фалькларыстыкі» (т. 1—2, 1958—63) змяшчае факты з гісторыі збірання і вывучэння бел. нар. творчасці. Бел. фальклорны матэрыял выкарыстаў у каментарыях да складзенага ім зб. «Народныя казкі пра бога, святых і папоў: Рускія, беларускія і ўкраінскія» (1963).

**АЗАЗЛУЧЭ́ННІ**, хімічныя арганічныя злучэнні, якія змяшчаюць азагрупу -N=N-, звязаную з двума радыкаламі. Радыкалы бываюць аліфатычныя, араматычныя ці гетэрацыклічныя з функцыян. групамі (OH, $NH^2$, CN) або без іх. Найпрасцейшыя А. — азаметан $CH_3N=NCH_3$, *азабензол*. Для А. характэрна цыс- і трансізамерыя, для оксізамяшчальных — таўтамерыя. Асн. метад атрымання — *азаспалучэнне*. Аліфатычныя А. выкарыстоўваюць як ініцыятары палімерызацыі і сітавінаўтваральнікі, араматычныя з OH- і $NH_2$-групамі як сінт. *азафарбавальнікі* і кіслотна-асноўныя індыкатары ў аналітычнай хіміі.

**АЗАКЕРЫ́Т** (ад грэч. ozo пахну + keros воск), г о р н ы в о с к , мінерал, прыродны нафтавы бітум; сумесь цвёрдых насычаных вуглевадародаў. Колер ад светла-жоўтага да амаль чорнага. Кансістэнцыя ад мяккай, пластычнай да цвёрдай. Цв. 1. Шчыльн. 0,85—1 г/см$^3$, $t_{пл.}$ 50—85 °С.

А. — парафіністы асадак, які выпадае з нафты пры яе ахаладжэнні ў выніку падняцця на паверхню па трэшчынах. Залягае ў жылах, пластах. Выкарыстоўваецца ў радыё-, электратэхніцы, парфумернай і лакафарбавай прам-сці, медыцыне (гл. *Азакерыталячэнне*).

**АЗАКЕРЫТАЛЯЧЭ́ННЕ**, а з а к е р ы т а т э р а п і я , метад грязе- і цеплалячэння, заснаваны на выкарыстанні *азакерыту*. Асн. спосаб — накладванне *аплікацый*. Спалучае цеплафіз. (за кошт награвання высокацеплаёмістага азакерыту да пэўнай т-ры) і хім. (за кошт біял. актыўных рэчываў азакерыту) уздзеянні на арганізм. Механізмы ўплыву рэалізуюцца праз рэакцыі мясцовага (паляпшэнне крова- і лімфазвароту, нервовай трофікі, процізапаленчыя, абязбольваючыя і рассысальныя эфекты) і агульнага (рэфлекторна-гумаральныя змены ў дзейнасці асн. фізіял. сістэм) характару. Аптымальны эфект мае, калі цеплавая нагрузка не з'яўляецца для арганізма празмернай і не перакрывае біяхім. змены на малекулярным, субклетачным і клетачным узроўнях. Выкарыстоўваецца пры некаторых захворваннях апорна-рухальнага апарату, вуха, горла, носа, пры траўмах, спайкавых працэсах у брушной поласці, малым тазе і інш. Проціпаказана пры наяўнасці пухлін, актыўных формах туберкулёзу, сардэчна-сасудзістых хваробах, вострых запаленчых працэсах.

**АЗА́Л** (Özal) Тургут (13.10.1927, г. Малацья, Турцыя — 17.4.1993), дзярж. і паліт. дзеяч Турцыі. Скончыў Стамбульскі тэхн. ун-т (1950). Займаўся выкладчыцкай дзейнасцю, працаваў у розных мін-вах і прыватных кампаніях, у 1967—71 узначальваў дзярж. планавую арг-цыю. У 1980—82 нам. прэм'ер-міністра па эканам. пытаннях. У 1983 пасля зняцця ў Турцыі забароны на паліт. дзейнасць — ген. старшыня Партыі айчыны. У 1983—89 прэм'ер-міністр, у 1989—93 прэзідэнт Турэцкай рэспублікі.

**АЗАНАВА́ННЕ**, 1) акісленне арган. злучэнняў азонам з утварэннем *азанідаў* ці інш. злучэнняў. Выкарыстоўваецца ў арган. сінтэзе кіслародзмяшчальных злучэнняў. 2) Апрацоўка азонам паветра ці вады з дапамогай азанатараў для абеззаражвання і акіслення ў іх арган. рэчываў.

**АЗАНА́ЛЬНАСЦЬ** (ад *а...* + *занальнасць*), пашырэнне прыроднай з'явы без сувязі з занальнымі асаблівасцямі пэўнай тэрыторыі. Абумоўлена геал. структурай, асаблівасцямі літалогіі, тэктанічным рэжымам, характарам рэльефу і інш. ўнутр. фактарамі. Прыводзіць да прасторавых адрозненняў у клімаце,

водным рэжыме, глебах і арган. свеце. Найб. яскрава выяўляецца ў гарах.

**АЗАНА́ЛЬНАЯ РАСЛІ́ННАСЦЬ**, прыродная расліннасць, якая трапляецца ва ўсіх зонах як уключэнне ў *занальную расліннасць* на нехарактэрных для яе месцах росту. Найб. рэзка ўздзеянне азанальных фактараў праяўляецца ў гарах, на лугах у поймах рэк паўпустынь і пустынь. На Беларусі А.р. трапляецца на заліўных лугах, часткова ў вадаёмах і інш. мясцінах. Тэрмін «А.р.» увёў польскі біёлаг Ю.Пачоскі (1915). Гл. таксама *Інтразанальная расліннасць*.

**АЗАНАСФЕ́РА** (ад грэч. ozo пахну + сфера), азонавы экран, слой у межах *стратасферы* з павышанай канцэнтрацыяй азону (на выш. 20—25 км у 10 разоў большая, чым каля паверхні Зямлі). Затрымлівае асн. ч. пагібельнага для ўсяго жывога касм. выпрамянення. Максімум азону ў А. прыпадае на вясну, мінімум — на восень. З сярэдзіны 1980-х г. над Антарктыдай было зафіксавана перыяд. знікненне азону (азонавая дзірка), зменшылася яго колькасць і над іншымі тэрыторыямі. Мяркуюць, што ўзнікненне і пашырэнне азонавых дзірак тлумачыцца ўздзеяннем на А. выкідаў у атмасферу хлорфторвугляродаў (фрэонаў).

**АЗА́НДЭ** (Azande), пласкагор'е ў Цэнтр. Афрыцы, на тэр. ЦАР, Заіра і Судана, водападзел паміж бас. р. Конга (Заір), воз. Чад і р. Ніл. Сярэднія выш. 600—900 м, найб. выш. 1388 м (г. Нгая). Характэрны купалападобныя горы, астанцавыя гранітныя хрыбты. Складзена са стараж.-крышт. парод (граніта-гнейсы, габра-амфібаліты). Радовішчы золата і алмазаў. Высакатраўная саванна з плямамі рэдкастойных лістападных лясоў. Уздоўж рэк вечназялёныя галерэйныя лясы.

**АЗАНІ́ДЫ**, від пераксідных злучэнняў. Неарган. А. — злучэнні шчолачных металаў і амонію, у якіх ёсць малекулярны іон $O_3^-$. Чырв. крышталі, парамагнітна раскладаюцца з утварэннем азону пры t вышэй за 60 °С. Моцныя акісляльнікі, гідралізуюцца вадой. Атрымліваюць узаемадзеяннем гідраксідаў з азанаваным кіслародам. У малекулах арган. А. існуе пяцічленны цыкл



**АЗА́РАНКА** Емяльян Кліментавіч (17.7.1908, в. Узнікі Быхаўскага р-на Магілёўскай вобл. — 22.2.1988), бел. філосаф. Д-р філас. н. і праф. (1962). Скончыў Ленінградскі ун-т (1938). З 1950 прарэктар БДУ, у 1957—75 заг. кафедры Мінскага мед. ін-та. Даследаваў праблемы дыялектычнага матэрыялізму, сац. філасофіі і культуры. Аўтар прац «Развіццё Г.В.Пляханавым філасофіі марксізму» (1958), «Светапогляд М.В.Ламаносава» (1959) і інш.

**АЗА́РАНСКАЕ ВО́ЗЕРА**, Азаранкаўскае возера, у Беларусі, на мяжы Лепельскага і Ушацкага р-наў Віцебскай вобл., у бас. р. Ула. Пл. 0,35 км², даўж. 0,9 км, найб. шыр. 0,59, найб. глыб. 1,9 м, даўж. берагавой лініі 2,35 км. Пл. вадазбору 5,6 км². Схілы выш. 3—5 м, парослыя хмызняком. Берагі забалочаныя, тарфяністыя. Дно выслана сапрапелем. Сцёк па ручаі ў р. Вароніца.

**АЗА́РАЎ** Сямён Іванавіч (31.1.1909, в. Вілейка Чавускага р-на Магілёўскай вобл. — 8.5.1942), Герой Сав. Саюза (1943). Скончыў Ленінградскую ваен. пяхотную школу (1931). Удзельнік сав.-фінляндскай вайны 1939—40. У Вял. Айч. вайну полк пад камандаваннем падпалк. А. вызначыўся ў баях пад Ленінградам і ў Карэліі. Загінуў у баі.

**АЗА́РТ** (ад франц. hasard выпадак, рызыка), заўзятасць, гарачнасць, моцнае захапленне.

**АЗАРЫДЗІ́Н**, тое, што *этыленімін*.

**АЗА́РЫЦКІ БОЙ 1942**. Адбыўся ў Вял. Айч. вайну паміж партыз. атрадамі «Чырвоны Кастрычнік» (камандзір Э.Я.Чырлін), А.Ф.Каваленкі, І.Р.Жулегі, Капаткевіцкім (камандзір А.А.Жыгар) і ням.-фаш. акупантамі ў в. Азарычы Калінкавіцкага р-на Гомельскай вобл. 17 лютага. Аперацыяй кіраваў Герой Сав. Саюза Ф.І.*Паўлоўскі*. Партызаны, знішчыўшы фаш. гарнізон у в. Валосавічы, накіраваліся да в. Азарычы, дзе размяшчаліся гарнізон ворага з 70 чал. і склады са збожжам для адпраўкі ў Германію. Раніцай партыз. атрады занялі зах. частку вёскі, ударныя групы атакавалі каравульнае памяшканне. У выніку 3-гадзіннага бою партызаны без страт са свайго боку разгромілі гарнізон, захапілі зброю, раздалі насельніцтву 850 т збожжа.

**АЗА́РЫЦКІЯ ЛА́ГЕРЫ СМЕ́РЦІ**. Тры

Да арт. **Азанальнасць.** Пяскі, якія развяваюцца, у тайзе Забайкалля (Чарская катлавіна).

Мемарыяльны комплекс вязням **Азарыцкіх лагераў смерці.**

лагеры, створаныя ням. фашыстамі ў сак. 1944, недалёка ад пярэдняга краю абароны, каля г.п. Азарычы, вёсак Дзерць і Падасіннік Калінкавіцкага р-на Гомельскай вобл. Больш за 50 тыс. непрацаздольных грамадзян фашысты трымалі на адкрытых балоцістых мясцінах, размясціўшы сярод вязняў сыпна-тыфозных хворых з мэтай распаўсюдзіць эпідэмію сярод наступаючых часцей Чырв. Арміі. Да вызвалення (18—19.3.1944) жывымі асталіся 33 480 чал., з іх дзяцей да 13 гадоў 15 960, жанчын 13 072, старых 4448. На месцы лагераў каля г.п. Азарычы мемарыяльны комплекс.

Да арт. Азарэвічы. Надзея Апалонаўна і Марыя Апалонаўна. Невядомыя мастакі.

**АЗА́РЫЧЫ**, гарадскі пасёлак у Беларусі, у Калінкавіцкім р-не Гомельскай вобл., на левым беразе р. Віша. Цэнтр пасялковага Савета і саўгаса «Азарычы». За 42 км на Пн ад Калінкавіч, 22 км ад чыг. ст. Халоднікі на лініі Жлобін — Калінкавічы, на аўтадарозе Калінкавічы — Бабруйск. 1,7 тыс. ж. (1995).

У сярэдзіне 16 ст. вёска ў Мазырскім пав. ВКЛ. З 1786 у А. праводзіліся 2 кірмашы на год. З 1793 у складзе Рас. імперыі. З канца 19 ст. мястэчка, цэнтр Бабруйскага пав. У 1878 — 900 ж. У 1924—31 цэнтр сельсавета і раёна, у 1931—35 цэнтр сельсавета Мазырскага р-на, у 1935—60 — Даманавіцкага р-на і Азарыцкага сельсавета. З 1938 вёска. У Вял. Айч. вайну ў сак. 1944 ням.-фаш. захопнікі стварылі паблізу А. *Азарыцкія лагеры смерці*. З 1959 гар. пасёлак. З 1960 у Калінкавіцкім р-не.

Сепаратарнае аддз. Мазырскага малочнага з-да, участкі Калінкавіцкага ляспгаса і лясніцтва, хлебапякарня, геафіз. экспедыцыя. Сярэдняя школа, дапаможная школа-інтэрнат. Дом культуры, 2 б-кі, бальніца, аптэка, дзіцячы сад-яслі, аддз. сувязі, кафэ. Брацкая магіла і брацкія могілкі сав. воінаў і партызан. Мемарыяльны комплекс вязням Азарыцкіх лагераў смерці.

**АЗА́РЫЧЫ**, вёска ў Беларусі, у Валішчанскім с/с Пінскага р-на Брэсцкай вобл. Цэнтр калгаса «Рассвет». За 44 км на ПнЗ ад Пінска, 232 км ад Брэста, 45 км ад чыг. ст. Пінск, 0,5 км ад шашы Пінск—Іванцэвічы. 905 ж., 305 двароў (1995). Сярэдняя школа, б-ка, Дом культуры, аддз. сувязі. Магіла ахвяр фашызму.

**АЗАРЭ́ВІЧ** Дзмітрый Іванавіч (1.11.1848, г. Горкі Магілёўскай вобл. — 1912), расійскі вучоны. Д-р юрыд. н. (1877), праф. Новарасійскага (Адэскага, 1882) і Варшаўскага (1887) ун-таў. Скончыў Пецярбургскі ун-т (1870). З 1874 праф. у Дзямідаўскім юрыд. ліцэі ў Яраслаўлі. Навук. працы па гісторыі і практыцы рым. права.

*Тв.*: История византийского права. Ч. 1—2. Ярославль, 1876—77; Античный мир и христианство. Ярославль, 1880; Система римского права. Т. 1—3. Спб., Варшава, 1887—89.

*В.А.Гапоненка.*

**АЗАРЭ́ВІЧЫ**, Азарэвічавы, сям'я бел. і рус. акцёраў 18—19 ст.

Пелагея (па сцэне Жывакіна; ?, Шклоў — ?), артыстка балета. Прыгонная. Вучылася ў балетмайстра Марыядзіні. Прымадонна балета *Шклоўскага тэатра Зорыча*. У 1799 адпушчана на волю, выступала на пецярбургскай, потым да 1812 на маскоўскай сцэне. Маці акцёра В.І.*Жывакіні*.

Кацярына Лук'янаўна (?, Шклоў — пасля 1870), артыстка балета. Прыгонная. Пляменніца Пелагеі, маці Надзеі і Марыі А. Вучаніца балетмайстра М.*Пранчынскага*. Да 1799 вядучая танцоўшчыца Шклоўскага тэатра Зорыча. У 1800 перададзена дырэкцыі Пецярбургскіх імператарскіх тэатраў. У 1802 адпушчана на волю.

Надзея Апалонаўна (па сцэне Азарэвіч 1-я, па мужу Навіцкая; каля 1802, Пецярбург — ?), артыстка балета і драмы. Вучылася ў імператарскім тэатр. вучылішчы ў балетным класе і ў т. зв. «маладой трупе» А.*Шахаўскога*. У 1821—27 выступала на пецярбургскай імператарскай сцэне. Вызначалася ў пантамімных балетах Агюста і Ш.Дзідло.

Марыя Апалонаўна (па сцэне Азарэвіч 2-я; 1804, Пецярбург — 14.11.1888), драм. актрыса. Вучаніца Шахаўскога і К. Сямёнавай. У 1821—43 выступала на пецярбургскай імператарскай сцэне ў трагедыях і камедыях. Першая выканаўца ролі Лізы ў спектаклі «Гора ад розуму» А.Грыбаедава (паст. 1831).

**АЗАСПАЛУЧЭ́ННЕ**, хімічная рэакцыя ўзаемадзеяння араматычных *дыазазлучэнняў* з азаскладальнымі, пераважна араматычнымі амінамі і феноламі. Працякае звычайна ў водным асяроддзі (pH 2 — 6 ці 6 — 11 для амінаў і фенолаў адпаведна) пры t 0—30 °С з утварэннем *азазлучэнняў*. А. — асноўны прамысловы спосаб вытв-сці *азафарбавальнікаў*.

**АЗАТАВА́ННЕ** ў тэхніцы, від *хіміка-тэрмічнай апрацоўкі*; насычэнне паверхні метал. вырабаў азотам. Павышае паверхневую цвёрдасць, зносаўстойлівасць і карозійную стойкасць. Вырабы з легіраваных сталяў азатуюць у герметычных муфельных печах пры t 500—700 °С 15 мін — 90 гадз (у залежнасці ад патрэбнай таўшчыні азатаванага слоя). Высокая цвёрдасць азатаванай паверхні (1200 па Вікерсу) звязана з утварэннем у ёй нітрыдаў і карбанітрыдаў легіравальных элементаў. Вырабы са сплаваў тытану апрацоўваюць пры t 850—950 °С 10—50 гадз у асяроддзі тэхн. азоту, ачышчанага ад кісларoду і вільгаці. А. праводзяць таксама ў тлеючым разрадзе. Выкарыстоўваецца для апрацоўкі некаторых інструментаў, цыліндраў і клапанаў рухавікоў, дэталяў быстраходных станкоў і інш.

**АЗАТЭМІ́Я** (ад *азот* + грэч. haima кроў), празмерная колькасць у крыві азотазмяшчальных прадуктаў бялкавага абмену. Абумоўліваецца недастатковасцю выдзяляльнай функцыі нырак і мочавыдзялення, павышаным распадам бялку.

**АЗАЎСКІ́Т** (ад назвы Азоўскага мора), мінерал. Агрэгаты шчыльныя, уключэнні, лускавінкі, сеткаватыя пражылкі. Колер цёмна-буры. Бляск смалісты. Цв. 4. Крохкі. Лёгка растваряецца ў салянай і азотнай кіслотах.

**АЗАФАРБАВА́ЛЬНІКІ**, клас *фарбавальнікаў*, у малекуле якіх адна ці некалькі азагруп -N=N-, звязаных з радыкаламі арган. злучэнняў (араматычных, гетэрааратычных, з актыўнымі $CH_2$-групамі). У склад малекулы ўваходзяць таксама замяшчальныя і незамяшчальныя аміна- і гідраксігрупы, сульфакіслотная група $SO_3H$, нітратная $NO_3$, карбаксільная COOH і інш. Сінтэз А. заснаваны пераважна на рэакцыі *азаспалучэння*. Па колькасці азагруп адрозніваюць мона-, ды- і поліазафарбавальнікі.

Колер монаазафарбавальнікаў залежыць ад хім. будовы радыкалаў, звязаных з азагрупай, колькасці і месцазнаходжання замяшчальнікаў у іх. Прасцейшыя А. звычайна жоўтага, аранжавага ці чырв. колеру. Паглыбленне колеру звязана з колькасцю аміна-, гідраксі- і азагруп, велічынёй сістэмы спалучэння малекулы А., яе палярызацыяй, наяўнасцю спалучэння паміж азагрупамі. Паводле хім. будовы, асаблівасцяў узаемадзеяння з матэрыяламі А. падзяляюцца на: *пігменты*; дысперсныя А. (нерастваральныя ў вадзе, растваральныя ў арган. растваральніках і палімерах); *асноўныя фарбавальнікі*; *кіслотныя фарбавальнікі*; лакі (звычайна нерастваральныя ў вадзе солі барыю ці кальцыю кіслотных фарбавальнікаў); *пратраўныя фарбавальнікі*, *прамыя фарбавальнікі*; актыўныя фарбавальнікі (уступаюць ў хім. рэакцыі з малекуламі матэрыялаў); *азагены*; металазмяшчальныя комплексныя злучэнні А. Уключаюць фарбавальнікі ўсіх колераў і адценняў, усіх груп па тэхнал. выкарыстанні. На долю А. прыпадае больш за палову вытв-сці фарбавальнікаў. Выкарыстоўваюцца на фарбаванне прыродных і сінт. валокнаў, скуры, паперы, гумы, пластмас, як пігменты для лакаў, фарбаў, пры вытв-сці каляровых алоўкаў і інш.

*Літ.*: Аналитическая химия синтетических красителей: Пер. с англ. Л., 1979.

**АЗБАЛА́Н** (ад грэч. asbolos куродым, сажа), мінерал, водны вокісел марганцу, кобальту і нікелю пераменнага саставу; кобальтавы вад, $(Co, Ni)O{\cdot}MnO_2{\cdot}nH_2O$. Прымесі ванадыю, цынку. Пераважна аморфны. Утварае сажыстыя зямлістыя масы, нацечныя агрэгаты. Колер чорны з сіняватым адлівам. Цв. 4—5. Шчыльн. 3,4 г/см³. Трапляецца ў невял. намнажэннях у кары выветрывання нікеляносных серпенцінаў. Патэнцыяльная кобальтавая руда.

**АЗБАПЛА́СТЫКІ**, пластмасы з азбеставых валакністых напаўняльнікаў і тэрмарэактыўных, пераважна аміна-альдэгідных і фуранавых смолаў. Падзяляюцца на азбатэксталіты (напаўняльнік — азб. тканіна), азбавалакніты (напаўняльнік — валакно) і азбагетынаксы (напаўняльнік — папера). Маюць высокую мех. трываласць, цепластойкасць, фрыкцыйнасць, электраізаляцыйныя, антыкаразійныя ўласцівасці. Выкарыстоўваюцца ў выт-сці ратацыйных помпаў і электраабсталявання, тармазных калодак, каразійнаўстойлівай ізаляцыі, трубаў, кранаў, элементаў цеплаховы ракет і касм. апаратаў.

**АЗБЕ́СТ** (грэч. asbestos літар. нязгасны, неразбуральны), горны лён, мінералы класа водных сілікатаў магнію, жалеза і інш. з групы *серпенціну* (хрызатыл-А.) і групы *амфіболаў* (амфібол-А.). Паралельна-валакністай будовы, расшчапляюцца на тонкія, трывалыя валокны. Колер залаціста-жоўты, зялёны, да чорнага, распушаны — белы. Бляск шаўкавісты. Цв. 2—2,5. Шчыльн. 2,5 г/см$^3$. Вогнеўстойлівы (t пл. каля 1500 °С). У прам-сці выкарыстоўваецца пераважна хрызатыл-А. Радовішчы А. звязаны з ультраасн. пародамі. Выкарыстоўваецца ў выт-сці азбестацэмент. трубаў і шыферу, азбестатэхн. прам-сці (тканіны, шнуры, стужкі), выт-сці пластмасавых і гумавых вырабаў з азбеставым напаўненнем (тармазныя калодкі, фрыкцыйныя кольцы, электраізаляцыйныя матэрыялы і інш.), таксама ў выт-сці паперы, кардону, фільтраў.

**АЗБЕ́СТАВАЯ ПРАМЫСЛО́ВАСЦЬ**, падгаліна прам-сці буд. матэрыялаў, аб'ядноўвае горнаабагачальныя камбінаты, якія ажыццяўляюць здабычу і выт-сць таварнага *азбесту*.

Фарміраванне А.п. пачалося ў канцы 19 — пач. 20 ст. (Італія, Канада), калі шырокае развіццё атрымала выт-сць тэрмастойкіх азбеставых вырабаў і азбестацэментных буд. матэрыялаў. Сучасная А.п. выпускае больш за 3 тыс. розных матэрыялаў і вырабаў. Асноўныя запасы азбесту сканцэнтраваны ў Канадзе і Расіі (па выт-сці азбесту б. СССР займаў 1-е месца ў свеце). Агульныя запасы азбеставага валакна ацэньваюцца ў 123 млн. т (без б. сацыяліст. краін). Большая іх частка (88%) належыць прамыслова развітым краінам, пераважна Канадзе (77%, правінцыя Квебек). Выт-сць азбеставага валакна ў свеце складае больш за 4 млн. т у год, у т.л. ў Канадзе і Рас. Федэрацыі каля 2 млн. т у кожнай. У Расіі А.п. сканцэнтравана на камбінатах «Уралазбест», «Тувааазбест», «Арэнбургазбест» і інш. Запасы разведаны на 28 радовішчах, пераважна на Сярэднім і Паўд. Урале і Пд Усх. Сібіры. А.п. развіта ў Казахстане, дзе пабудаваны камбінат «Кустанай-азбест» на базе Джэтыгарскага радовішча. Буйныя вытворцы азбесту таксама ПАР, Зімбабве, Італія, Аўстралія, ЗША, Кітай. Здабываюць азбест пераважна адкрытым спосабам (у кар'ерах), у невял. аб'ёмах — падземным. Абагачальныя ф-кі — высокамеханізаваныя і аўтаматызаваныя прадпрыемствы з абагачальным абсталяваннем і ўстаноўкамі ачысткі паветра сярэдняй магутнасцю 330 тыс. т азбесту за год. Буйнейшыя пастаўшчыкі азбеставага валакна на сусв. рынак — Канада, Расія, ПАР, Зімбабве. Гал. імпарцёры прадукцыі — ЗША, Японія, ФРГ, Францыя, Вялікабрытанія.

*Л.І.Тулупава.*

**АЗБЕСТАЦЭМЕ́НТ**, будаўнічы матэрыял з сумесі *цэменту*, *азбесту* і вады. Састаў: 100 ч. (па масе) *партландцэменту*, 12—20 ч. азбесту, у асн. нізкіх гатункаў. Да застывання цэменту А. пластычны і трывалы на расцягванне, што дае магчымасць фармаваць з лістоў таўшчынёй 5—10 мм розныя вырабы; у застылым стане мае высокія фіз.-мех. ўласцівасці: трываласць на выгін да 30 МПа, на сціскванне да 90 МПа, ударная вязкасць 1,8—2,5 кДж/м$^2$; даўтавечны, маразастойкі, вогнетрывалы, з павышанай хім. устойлівасцю. Крохкасць і дэфармаванне А. пры высокай вільготнасці змяншаюць гідрафабізацыяй (гл. *Гідрафобныя пакрыцці*) і дадатковым арміраваннем. З А. вырабляюць лісты, трубы, пліты, дахавыя прафіляваныя і плоскія лісты (*шыфер*). Гл. таксама *Азбестацэментныя вырабы і канструкцыі.*

Азбалан.



Да арт. Азбест. Амфібол-азбест.

Азбестацэментныя вырабы і канструкцыі. Абалонка пакрыцця і тарцовыя сцены летняга спальнага павільёна.

**АЗБЕСТАЦЭМЕ́НТНЫЯ ВЫ́РАБЫ І КАНСТРУ́КЦЫІ**, будаўнічыя вырабы і канструкцыі з азбестабетону. Азбестацэментныя вырабы (АВ) падзяляюцца на ліставыя (прасаваныя і непрасаваныя, плоскія і профільныя), трубныя і экструзійныя (гл. *Экструзія*). Ліставыя АВ бываюць сценавыя, дахавыя, электраізаляцыйныя і спец. прызначэння (ідуць на вентыляцыйныя каробкі, паўцыліндры, скляпеністыя элементы і інш.). Памер лістоў 1,5 м × 3,6 м, таўшчыня 4—20 мм. Да трубных АВ адносяцца напорныя (воданапорныя), газаправодныя, безнапорныя і абсадныя трубы. Даўж. трубаў 3—6 м, унут. дыяметр да 576 мм. Экструзійнымі вырабамі з'яўляюцца *швелеры* даўж. 3 м і выш. 70—170 мм. Азбестацэментныя канструкцыі (АК) вырабляюцца з *азбестацэменту*, цеплаізаляцыйных матэрыялаў з драўлянымі, азбестацэментнымі ці метал. элементамі каркаса. Да АК адносяцца ўцепленыя (звычайна мінер. лямцам) пліты для пакрыццяў вытв. будынкаў. Маналітныя канструкцыі (пліты і панелі) робяць з двух плоскіх лістоў, злучаных слоем уцяпляльніка (звычайна пенапласту). Найб. пашыраны канструкцыі каркаснага тыпу — пліты і панелі з плоскіх азбестацэментных лістоў, злучаных з каркасам клеем ці шрубамі. Каркас робяць з азбестацэментных ці метал. профіляў, драўляных брускоў. Шырыня пліт 1,2—1,5 м, пралётаў, што імі перакрываюцца, — 3 і 6 м. АК лёгкія і часта больш эканамічныя за жалезабетонныя.

**А́ЗБУКА** (ад назвы першых дзвюх літар стараслав. алфавіта «аз» і «буки»), 1) тое, што *алфавіт*. 2) Тое, што *буквар*.

**А́ЗБУКІН** Мікалай Васілевіч (1894, Бабруйск — 24.11.1943 ?), бел. географ, краязнавец. У 1912—17 вучыўся ў Пецярбургскім ун-це. З 1917 выкладаў у Бабруйскай гімназіі, у 1921—30 на кафедры геаграфіі Інбелкульта і АН Беларусі. Адзін з арганізатараў краязнаўчага руху на Беларусі, чл. Цэнтр. бюро краязнаўства пры АН Беларусі. Асн. працы па геаграфіі Беларусі і інш. краін: «Геаграфія Еўропы» (1924), «Геаграфія пазаеўрапейскіх краёў» (у сааўт.), «Паселішчы гарадскога тыпу ў БССР» і інш. У 1930 рэпрэсіраваны. Рэабілітаваны ў 1957.

**АЗБУКО́ЎНІКІ**, ананімныя рукапісныя зборнікі артыкулаў навучальнага і пазнавальна-энцыклапедычнага характару, пашыраныя на землях усх. славян у 13—18 ст. Захавалася больш за 200 А. Першыя А. (напр., А. у Ноўгарадскай кормчай 1282) толькі тлумачылі незразумелыя іншамоўныя словы, што сустракаліся ў перакладных кнігах

рэліг. зместу. Пазней тлумачэнні дапаўняліся звесткамі энцыклапедычнага характару па гісторыі, геаграфіі і інш. У 17—18 ст. А. пашырылі навуч. функцыю: іх часткамі сталі азбука (са складамі і пропісямі) і кароткія звесткі грамат., арыфм., рэліг.-павучальнага характару. Выконвалі і збіральніцкую функ-

З.І.Азгур.

цыю (назапашванне рэдкіх слоў).

Словы ў А. звычайна размяшчаліся па алфавіце, перакладаліся і тлумачыліся, таму А. сталі крыніцай для першых друкаваных слоўнікаў усх. славян. Прыкладам бел. А. з'яўляецца «Тлумачэнне імёнам па алфавіце» (17 ст.).

*Літ.:* Пруссак А.В. Описание азбуковников, хранящихся в рукописном отделении императорской Публичной библиотеки. Спб., 1915; Алексеев М.П. Словари иностранных языков в русском азбуковнике XVII в. М., 1968; Ковтун Л.С. Азбуковники, или Алфавиты иностранных речей конца XVI—XVII вв. // Вопросы языкознания. 1980. № 5.

*В.К.Шчэрбін.*

**АЗГІ́НАВІЧЫ**, вёска ў Беларусі, у Слонімскім р-не Гродзенскай вобл., каля вытокаў р. Була. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Леніна. За 12 км на ПдЗ ад Слоніма, 180 км ад Гродна, 15 км ад чыг. ст. Слонім, на шашы Слонім—Ружаны. 84 ж., 42 двары (1994). Каля вёскі селішча 1-га тыс. н.э.

**АЗГУ́Р** Заір Ісакавіч (15.1.1908, в. Маўчаны Сенненскага р-на Віцебскай вобл. — 18.2.1995), бел. скульптар. Нар. мастак Беларусі (1944), нар. мастак СССР (1973). Чл. АМ СССР (1958), Герой Сац. Працы (1978). Вучыўся ў Віцебскім маст. тэхнікуме, Ленінградскім і Кіеўскім маст. ін-тах. Працаваў у галіне станковай і манум. скульптуры, прыхільнік строгай рэаліст. формы. У канцы 1920-х—30-я г. стварыў партрэты дзеячаў сацыяліст. і рэв. руху для Дома ўрада ў Мінску. Прыкладам тонкага разумення сутнасці гіст. асобы з'яўляюцца партрэты пісьменнікаў Лу Сіня і Р.Тагора. Стварыў галерэю партрэтаў герояў Вял. Айч. вайны. Найб. значныя манум. работы: помнікі-бюсты С.І.Грыцаўцу, Я.Купалу і Ф.Э.Дзяржынскаму ў Мінску, В.І.Талашу ў Петрыкаве, помнікі П.М.Машэраву ў Віцебску і інш. Вобраз Я.Коласа ўвасоблены ў помніку паэту ў Мінску. Сярод станковых работ 1980-х г. партрэт М.Гусоўскага. З 1980 кіраўнік Творчай майстэрні скульптуры ў Мінску. Аўтар публіцыст. твораў па праблемах выяўл. мастацтва і мемуараў («Незабыўнае», 1962; «Тое, што помніцца...», кн. 1—2, 1977—83). Дзярж. прэмія СССР 1946. *Э.А.Петэрсон.*



Да арт. Азбукоўнікі. «Книга глаголемая алфавит» (узор азбукоўніка-слоўніка, рукапіс 17 ст.).

**АЗДА́МІЧЫ**, вёска ў Беларусі, у Рамельскім с/с Столінскага р-на Брэсцкай вобл. Цэнтр калгаса «Колас». За 70 км на ПнУ ад Століна, 315 км ад Брэста, 77 км ад чыг. ст. Гарынь. 1241 ж., 431 двор (1995). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Царква.

**АЗДЗЕ́ЛІНА**, вёска ў Беларусі, у Гомельскім р-не. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Кірава. За 40 км на ПнЗ ад Гомеля, 10 км ад чыг. ст. Лазурная. 519 ж., 196 двароў (1994). Базавая школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі.

**АЗДЗЯ́ЦІЧЫ**, гарадзішча *штрыхаванай керамікі культуры*, курганныя могільнікі 8—9 ст. (з трупаспаленнямі) і 11—12 ст. *дрыгавічоў* (з трупапалажэннямі) каля в. Аздзяцічы Барысаўскага р-на Мінскай вобл. Выяўлены рэшткі 2 заглыбленых у зямлю жытлаў, ляпны посуд, прасліцы, жал. наканечнікі коп'яў і інш. У курганах 8—9 ст. знойдзены бронзавыя ўпрыгожанні, ляпныя гаршкі; у пахаваннях дрыгавічоў — бронзавыя і шкляныя пацеркі, скроневыя падвескі, жалезны нож і інш.

**АЗДЗЯ́ЦІЧЫ**, вёска ў Беларусі, у Барысаўскім р-не Мінскай вобл., за 2 км ад р. Бярэзіна. Цэнтр сельсавета і калгаса «Новае жыццё». За 42 км ад Барысава, 130 км ад Мінска, 30 км ад чыг. ст. Навасады. 1627 ж., 737 двароў (1994). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, урачэбны ўчастак, аддз. сувязі, камбінат быт. абслугоўвання. Каля А. — гарадзішча *штрыхаванай керамікі культуры* і курганныя могільнікі.

**АЗЕАТРО́ПНЫЯ СУ́МЕСІ**, азеатропы (ад *a*... + грэч. zeō кіплю + tropē змяненне), аднародныя вадкія сумесі, якія пры перагонцы ўтвараюць кандэнсат таго самага саставу, што і зыходны раствор. Прысутнасць азеатропаў перашкаджае раздзяленню вадкіх сумесяў і патрабуе спец. метадаў *рэктыфікацыі*. Некаторыя А.с. кіпяць пры больш высокай ці больш нізкай, чым іх кампаненты, т-ры. Сустракаюцца ў двайных, шматкампанентных сістэмах. Напр., сумесь 95,57% $C_2H_5OH$ (t кіп. 78,5 °С) і 4,43% $H_2O$ (t кіп. 100 °С) утварае А.с. (t кіп. 78,15 °С).

**АЗЕЛЯНЕ́ННЕ**, комплекс мерапрыемстваў па аднаўленні або стварэнні і выкарыстанні расліннага покрыва ў населеных месцах і іх наваколлі з мэтай паляпшыць якасць асяроддзя. Мае сан.-экалагічнае (зялёныя насаджэнні сярод забудоў, уключаючы прамысл. зоны, зніжаюць узровень шуму, затрымліва-

З.Азгур. Помнік Якубу Коласу ў Мінску. 1972.

юць пыл і аэразолі, садзейнічаюць памяншэнню канцэнтрацыі дыму і шкодных газаў у атмасферы, павелічэнню іанізацыі паветра, наяўнасці кісларoду і фітагенных злучэнняў, якія валодаюць бактэрыцыднымі ўласцівасцямі і знішчаюць узбуджальнікаў хвароб чалавека і жывёл, змяншаюць яркасць сонечнага святла і радыяцыйную т-ру і інш.), рэкрэацыйнае (месцы адпачынку), гаспадарчае (выконваюць ветраахоўную функцыю, з'яўляюцца сродкамі аптымальнага размеркавання ападкаў і павярхневага сцёку, барацьбы з эрозіяй глебы і інш.), арх.-дэкаратыўнае і эстэтычнае (ствараюць у нас. пунктах натуральнае пейзажнае асяроддзе, узбагачаюць іх арх. аблічча) значэнне. Зялёныя насаджэнні падзяляюцца на агульныя (паркі, сады, скверы, бульвары, алеі і інш.), абмежаваныя (у дварах школьных, дашкольных, лячэбных, н.-д. і інш. устаноў, у жылых раёнах) і спецыяльныя (вакол прамысл. прадпрыемстваў, водаахоўныя, проціпажарныя, супрацьэразійныя і інш.). Фарміраванне сістэмы А. ў розных нас. месцах залежыць ад іх геагр. становішча, мясц. кліматычных і прыродналандшафтных умоў (наяўныя лясныя масівы, асаблівасці рэльефу і глеб, размяшчэнне вадаёмаў), памераў, нар.-гасп. профілю і планіровачнай структуры гарадоў і пасёлкаў.

На Беларусі мэтанакіраванае А. пашырылася з 17—18 ст. (гл. *Садова-паркавае мастацтва*). Сучаснае А. ажыццяўляецца на аснове навукова-абгрунтаваных прынцыпаў і нарматываў: прадугледжваецца раўнамернае размеркаванне зялёных масіваў сярод забудовы ўсіх відаў, сувязь іх паміж сабой і з прыгараднымі лясамі і вадаёмамі, макс. захаванне існуючых насаджэнняў і інш. Зялёныя насаджэнні гарадоў займаюць каля 20% агульнай пл. гар. зямель і складаюць каля 40 тыс. га. Створана больш за 40 паркаў культуры і адпачынку, дзіцячых і спарт., каля 160 агульнагарадскіх, больш за 1 тыс. садоў і сквераў, каля 50 бульвараў, існуе каля 120 зялёных зон. Састаўной ч. А. горада з'яўляюцца насаджэнні прыгараднай зоны: лясы, лесапаркі, лугапаркі, пладовыя сады і інш., якія ствараюць умовы для масавага адпачынку насельніцтва і садзейнічаюць аздараўленню гар. паветра. Н.-д. работа па А. вядзецца ў Цэнтр. бат. садзе і Ін-це эксперым. батанікі АН Беларусі, БелНДІ праблем горадабудаўніцтва.

**АЗЕ́НА** (ад грэч. ozō пахну), хранічны насмарк з атрафіяй слізістай абалонкі носа, утварэннем скарынак з непрыемным пахам, зніжэннем або стратай нюху. Часцей назіраецца ў маладым узросце, развіваецца павольна на працягу многіх гадоў. Суправаджаецца змяненнямі крыві — гіпахромнай анеміяй, лейкапеніяй, павелічэннем САЭ. Лячэнне: антыбіётыкі, фізіятэрапеўтычнае, сімптаматычнае. Прафілактыка накіравана на выяўленне і лячэнне ранніх формаў захворвання.

**А́ЗЕНКУ́Р** (Azincourt), сяло на Пд ад г. Кале (Францыя), каля якога ў час *Стогадовай вайны 1337—1453* англ. войскі *Генрыха V* 25.10.1415 атрымалі перамогу над франц. арміяй, што дазволіла англічанам захапіць Пн Францыі, у т.л. Парыж.

**АЗЕРАЦКО́ЎСКІ** Мікалай Якаўлевіч (1750, с. Азерацкае Загорскага р-на Маскоўскай вобл. — 12.3.1827), рускі натураліст і падарожнік. Акад. Пецярбургскай АН (1782). У 1768—72 удзельнічаў у акад. экспедыцыі па вывучэнні прадукц. сіл Расіі. У 1773 працаваў на Беларусі, сабраў матэрыял пра стан гаспадаркі, побыт насельніцтва, прыроду, склаў гербарыі раслін Віцебскай губ. (400 відаў) і заал. калекцыі. Падарожнічаў па Анежскім і Ладажскім азёрах, воз. Ільмень, вярхоўях Волгі, воз. Селігер. Аўтар каля 100 навук. прац па геаграфіі, этнаграфіі, гісторыі і археалогіі.

**АЗЕРБАЙДЖА́Н**, Азербайджанская Рэспубліка. Размешчана ў паўд.-ўсх. ч. Закаўказзя, мяжуе на Пн з Расіяй, на ПнЗ з Грузіяй, на ПдЗ з Арменіяй і Турцыяй, на Пд з Іранам. Пл. 86,6 тыс. км² (разам з а-вамі Каспійскага м.). Нас. 7,3 млн. чал. (1992). Дзярж. мова азербайджанская. Пануючая рэлігія — іслам. Сталіца — г. *Баку*. У склад А. па канстытуцыі ўваходзяць Нахічэванская аўт. рэспубліка і тэр. Нагорнага Карабаха. Нац. свята — Дзень Рэспублікі (28 мая).

**Дзяржаўны лад**. А. — рэспубліка. Дзейнічае Канстытуцыя 1978 з больш познімі дадаткамі і папраўкамі. Канстытуцыйным актам 18.10.1991 абвешчана дзярж. незалежнасць краіны. Кіраўнік дзяржавы — прэзідэнт. Дзейнасць Вярх. Савета часова прыпынена, дэпутацкія паўнамоцтвы і статус усіх парламентарыяў захаваны на тэрмін іх выбрання. Вышэйшы орган заканад. улады з 18.5.1992 — Мілі меджліс — пастаяннадзеючы парламент з 50 дэпутатаў на чале са Старшынёй. Вышэйшы орган выканаўчай улады — Кабінет Міністраў, які ўзначальвае прэм'ер-міністр.

**Прырода**. Амаль палова тэр. А. — горы: Вялікі Каўказ — хрыбты Галоўны (г. Базардзюзю, 4466 м — найвышэйшы пункт А.) і Бакавы (г. Шахдаг, 4243 м); Курынская ўпадзіна — вял. міжгорны прагін, які займае Кура-Араксінская нізіна (28 м ніжэй за ўзр. м.); Малы Каўказ — сістэма складкавых хрыбтоў паміж рэкамі Кура і Аракс (г. Гямыш, 3724 м); Талышскія горы — займаюць паўд.-ўсх. ч. рэспублікі (г. Кюмюркёй, 2477 м). Уздоўж Каспійскага м. цягнецца вузкая паласа Ленкаранскай, на

Да арт. **Азеляненне**. Зялёныя насаджэнні: на вуліцы А.Міцкевіча ў Брэсце (злева); на тэрыторыі Аршанскага льнокамбіната.

Пн — Самур-Дывічынскай нізін. Узбярэжжа (працягласць 800 км) парэзана слаба. Найб. паўастравы — Апшэронскі, Курынская каса, Сара. Карысныя выкапні: нафта і прыродны газ (Апшэронскі п-аў, Кура-Араксінская нізіна, акваторыя Каспійскага м. каля в-ва Арцёма, Нафтавыя Камяні і інш.), алуніты (Заглік), жал. руда (Дашкесан), серны калчадан (Чырагідзорскае і Таганалінскае радовішчы), барыт (Чаўдарскае радовішча), поліметалічныя, хромавыя і кобальтавыя руды (М.Каўказ), руды мыш'яку, свінцова-цынкавыя і малібдэнавыя (Нахічэвань) і інш. Шмат мінер. і тэрмальных крыніц, ёсць радовішчы лекавай нафты (Нафталан), буд. і аблiцовачнага каменю, мармуру, гіпсу, мелу, сыравіна для вытв-сці шкла і цэменту. Клімат А. сухі субтрапічны на Кура-Араксінскай і Самур-Дывічынскай нізінах (сярэдняя т-ра студз. 1—3 °С, ліп. 26—27 °С, гадавая колькасць ападкаў 200—300 мм); вільготны субтрапічны на Ленкаранскай нізіне (сярэдняя т-ра студз. 3—4 °С, ліп. 26—28 °С, ападкаў за год 1900 мм — найб. колькасць у А.). У гарах высакагорны клімат падпарадкаваны вышыннай занальнасці (сярэдняя т-ра студз. на выш. больш за 2000 м -10 °С, ліп. да 5 °С, 600—800 мм ападкаў за год, 1400 мм на паўд. схілах В.Каўказа). Каля 1250 рэк, з іх 24 даўж. больш за 100 км. Гал. рэкі Кура і Аракс (крыніцы арашэння), значныя — Самур, Тэртэр, Арпа. Больш за 250 азёраў, найб. Гаджыкабул і Беюкшор; высакагорнае воз. Гёйгёль. На р. Кура створана Мінгечаурскае вадасх. (525 км$^2$), ад яго пачынаюцца Верхнекарабахскі і Верхнешырванскі арашальныя каналы. Глебы на нізінах (да выш. 200 м) шэразёмныя і бурыя паўпустынныя з саланцаватымі і саланчаковымі ўчасткамі, паўпустыннай расліннасцю (палын, салянкі, эфемеры), у перадгор'ях (300—500 м) — каштанавыя і карычневыя, на схілах гор — карычневыя і бурыя горна-лясныя глебы, на якіх растуць шыракалістыя лясы (бук, граб, дуб, каштан). Вышэй за 2000 м пояс горна-лугавых і дзярновых глебаў; разнатраўныя субальпійскія і альпійскія лугі — летнія пашы. У Талышскіх гарах захаваліся рэлікты трапічнай флоры: дэмірагач (жалезнае дрэва), самшыт, дзелква, гледычыя і інш. Жывёльны свет налічвае больш за 12 тыс. відаў: джэйран, дзік, дагестанскі тур, марал, дзікабраз, барсук, чаротавы кот; з птушак — турач, кеклік, фазан і інш. Каспій і Кура багатыя каштоўнай рыбай (ласось, асетр, сяўруга і інш.). Буйнейшыя запаведнікі: Закатальскі, Кызылагаджскі, Турыянчайскі, Шырванскі, Эльдарскі.

Герб і сцяг Азербайджана.

**Насельніцтва**. Асн. насельніцтва — *азербайджанцы* (больш за 82%); жывуць таксама рускія, армяне, лезгіны, аварцы, татары, цахуры, туркі, курды і інш. Сярэдняя шчыльнасць 85,8 чал. на 1 км$^2$ (1992), найб. шчыльна заселены Апшэронскі п-аў і прыгарадная зона Баку (150—300 чал. на 1 км$^2$), некаторыя раўнінныя і перадгорныя часткі. Гар. насельніцтва складае 54%. Буйн. гарады (1990): Баку (1149 тыс. ж.), Гянджа (281 тыс. ж.), Сумгаіт (235 тыс. ж.), Мінгечаур, Шэкі.

**Гісторыя**. Першыя пасяленні чалавека на тэр. А. адносяцца да эпохі палеаліту. З часоў неаліту тут вядома земляробства і жывёлагадоўля. Паселішчы таго часу знойдзены ў Кюльтэпэ, Ханлары, Мінгечауры. З 2-га тыс. да н. э. на тэр. А. вядома металургія бронзы, з пач. 1-га тыс. да н. э. — жалеза. Паселішчы бронзавага веку выяўлены ў раёнах Хаджалы, Кедабека, Дашкесана, Гянджы і інш. У 9 ст. да н. э. Пд А. ўваходзіў у рабаўладальніцкую дзяржаву Мана, у 7 ст. да н. э. — *Мідыю*, якая да сярэдзіны 6 ст. да н. э. захоплена персідскай дзяржавай *Ахеменідаў*. У 4 ст. да н. э. на Пд А. ўзнікла дзяржава *Атрапатэна*, якая пазней атрымала назву Азербайджан («Краіна хавальніка агню»); на Пд А. ўтварылася *Албанія Каўказская*. Феад. адносіны ў А. склаліся ў 3—5 ст. н. э. Сяляне за карыстанне зямлёй плацілі феадалам рэнту і неслі павіннасці, аднак фармальна не лічыліся прыгоннымі. Гандлёва-рамесніцкімі цэнтрамі сталі Барда, Кабала, Нахічэвань, Байлакан і інш. Сярэдневяковы А. неаднойчы заваёўвалі іншаземцы. У пач. 3 — сярэдзіне 7 ст. тут царавала дынастыя *Сасанідаў*, у 7 — сярэдзіне 9 ст. ўладарылі арабы. У канцы 5 — пач. 6 ст. ў А. і Іране разгарнуўся *маздакіцкі рух*; у 1-й пал. 9 ст. адбылося вял. сялянскае паўстанне (гл. *Бабека паўстанне 816—37*) супраць араб. і мясц. феадалаў, якое падарвала ўладу Арабскага халіфата. У 2-й пал. 9 ст. на тэр. А. ўтварыўся шэраг дзяржаў. Цэнтрамі эканомікі і культуры сталі гарады Тэбрыз, Нахічэвань, Баку, Шэмаха, Барда, Кабала, Гянджа і інш., якія вялі гандаль, у т.л. і з Кіеўскай Руссю. У сярэдзіне 11 ст. А. захапілі *сельджукі*, якія прычынілі значныя страты гаспадарцы і культуры краіны. У 13 ст. ў выніку манг. нашэсця А. увайшоў у *Хулагуідаў дзяржаву*. Вял. напływ цюркскіх плямёнаў у А. у 11—13 ст. прывёў да выцяснення стараж. мясц. моў і ўсталявання новай — *азербайджанскай мовы*. З гэтага часу фарміруецца і азерб. народнасць. Да сярэдзіны 14 ст. манг. панаванне ў А. падарвана супраціўленнем нар. мас, што выкарысталі мясц. феад. дынастыі. У канцы 14 — пач. 15 ст. на тэр. А. вылучылася самастойная дзяржава *Шырван*. Станоўчую ролю ў гісторыі А. адыграла *Сефевідаў дзяржава*, заснаваная ў пач. 16 ст. шахам Ісмаілам I. З канца 16 ст. ў ёй узмацніўся іранскі ўплыў; А. ператварыўся ў адну з ускраін Іранскай дзяржавы. У 16—18 ст. А. — арэна разбуральных войнаў паміж Іранам і Турцыяй. Азерб. народ вёў гераічную барацьбу супраць іншаземных і мясц. прыгнятальнікаў, што знайшло адлюстраванне ў эпасе пра нар. героя Кёр-аглы. У 1723—35 прыкаспійскія вобласці А. трапілі пад уладу Расіі, пазней зноў захоплены Іранам. У 2-й пал. 18 ст. ў А. ўзнікла каля 15 невял. ханстваў. Паводле руска-іранскіх пагадненняў (*Гюлістанскі мірны дагавор 1813*,

*Туркманчайскі дагавор 1828*) Паўн. А. далучаны да Рас. імперыі, Паўд. А. застаўся пад уладай Ірана. На пач. 19 ст. буйным цэнтрам прам-сці стаў Баку, які ў 1901 даваў каля паловы сусв. здабычы нафты. У 1903 бакінскія рабочыя выступілі ініцыятарамі стачак на Пд Расіі, у 1904 дамагліся заключэння першага ў Расіі калектыўнага дагавору. Пасля Лют. рэвалюцыі 1917 утварылася двоеўладдзе: у Баку існавалі Выканаўчы к-т грамадскіх арг-цый (мясц. орган Часовага ўрада) і Савет рабочых дэпутатаў, у які ўваходзілі прадстаўнікі розных партый і паліт. груповак: мусаватысты (гл. «*Мусават*»), дашнакі, эсэры, бальшавікі, меншавікі і інш. 9.11.1917 на пашыраным пасяджэнні Савета бальшавіцкая рэзалюцыя аб узяцці ўлады ў свае рукі адхілена. Аднак 13 ліст. пад націскам рабочых і салдат абвешчана сав. ўлада, выбраны новы выканком Савета. Барацьба за ўладу набыла ўзбр. характар. У сак. 1918 у Баку і інш. месцах адбылося паўстанне мусаватыстаў, якое было задушана. 25.4.1918 утвораны Бакінскі СНК на чале з С.Г.*Шаўмянам* (гл. *Бакінская камуна*). У маі ў Тыфлісе мусаватысты стварылі свой урад, які пазней пераехаў у Гянджу. 28.5.1918 абвешчана Азерб. дэмакр. рэспубліка. Ва ўмовах актывізацыі ваен. дзеянняў у Закаўказзі з боку Турцыі і няўдач Чырв. Арміі Бакінскі Савет 25 ліп. запрасіў у Баку англ. атрад. 31 ліп. Бакінскі СНК склаў свае паўнамоцтвы. 1 жн. з апазіцыйных Бакінскай камуне прадстаўнікоў *Цэнтракаспія* і выканкома Бакінскага Савета створаны новы ўрад — Дыктатура Цэнтракаспія і Прэзідыума выканкома Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Бакінскі Савет быў распушчаны, *бакінскія камісары* арыштаваны і 20 вер. расстраляны. 4 жн. Баку акупіравалі англ. войскі, якія праз 10 дзён былі выцеснены тур. часцямі. Разам з англічанамі Баку пакінулі прадстаўнікі толькі што створанага ўрада. У вер. 1918 да ўлады прыйшлі мусаватысты. Паводле ўмоў Мудраскага перамір'я паміж Антантай і Турцыяй апошняя вывела восенню 1918 свае войскі з Баку. На змену ім зноў прыбылі англ. войскі (выведзены восенню 1919). У выніку паўстання ў Баку 28.4.1920 адноўлена сав. ўлада, створаны СНК на чале з Н.Нарыманавым, А. абвешчаны сав. сацыяліст. рэспублікай. 30 крас. ў Баку прыбылі перадавыя атрады Чырв. Арміі. Сав. ўлада была ўстаноўлена і на астатняй тэр. А. Потым А. быў выкарыстаны як плацдарм для дзеянняў Чырв. Арміі супраць урадаў, што існавалі на той час у Арменіі і Грузіі. 19.5.1921 прынята 1-я Канстытуцыя Азерб. ССР. З 12.3.1922 да 5.12.1936 А. уваходзіў у *Закаўказскую федэрацыю* (ЗСФСР) і ў складзе яе з 30.12.1922 — у СССР. У складзе А. былі ўтвораны Нагорна-Карабахская аўт. вобл. (1923, гл. *Нагорны Карабах*) і Нахічэванская АССР (1924, гл. *Нахічэванская рэспубліка*). Пасля скасавання ў 1936 ЗСФСР А. — саюзная рэспубліка ў складзе СССР. У 1988 з-за прыналежнасці Нагорнага Карабаха паміж А. і Арменіяй узнік канфлікт, які пазней прыняў узбр. характар. Ускладнілася і ўнутрыпаліт. сітуацыя. Крывавыя падзеі на нац. глебе ў Сумгаіце ў 1989, сутыкненні насельніцтва з войскамі ў Баку на пач. 1990 разам з нагорна-карабахскім крызісам вымусілі ўвесці ў А. ў студз. 1990 надзвычайнае становішча. Пасля змен у канстытуцыі ў маі 1990 прэзідэнтам А. стаў камуністычны лідэр А.Муталібаў. У ліп. 1990 з апазіцыйных уладам грамадска-паліт. груп і аб'яднанняў створаны Дэмакр. форум А. 30.8.1991 Вярх. Савет А. прыняў дэкларацыю пра аднаўленне дзярж. незалежнасці на аснове Акта ад 1918. 18.10.1991 прыняты Канстытуцыйны акт «Аб дзяржаўнай незалежнасці Азербайджанскай рэспублікі». У канцы 1991 А. увайшоў у СНД. Рашэнне Вярх. Савета А. ад 26.11.1991 пра скасаванне статуса Нагорна-Карабахскай аўт. вобл., а з другога боку абвяшчэнне Нагорным Карабахам незалежнасці і прызнанне гэтага акта Арменіяй прывялі да эскалацыі азерб.-арм. канфлікту, фактычна пачалася неаб'яўленая вайна. Сац.-эканам. і паліт. крызіс у А., ускладненне карабахскай праблемы вымусілі прэзідэнта Муталібава да адстаўкі. На прэзідэнцкіх выбарах 7.6.1992 перамог А.Эльчыбей — лідэр Нар. фронту А. Краіна прыпыніла членства ў СНД. 24.6.1993 Нац. меджліс перадаў паўнамоцтвы прэзідэнта А. старшыні Вярх. Савета Г.*Аліеву*, які 3.10.1993 абраны прэзідэнтам краіны. З 1992 вядуцца перагаворы па ўрэгуляванні азерб.-арм. канфлікту. Пасрэднікамі ў гэтым працэсе выступаюць Балтыйскі Савет, АБСЕ, дзейнічае Мінская група АБСЕ па Нагорным Карабаху.

З 1992 А. — член ААН, АБСЕ, арг-цыі «Ісламская канферэнцыя» і інш. Дыпламат. адносіны з Рэспублікай Беларусь устаноўлены 11.6.1993.

Да арт. **Азербайджан.** Здабыча нафты на Каспійскім моры.

**Палітычныя партыі**. Нар. фронт А., Партыя нац. незалежнасці, «Мусават», Азерб. нар. партыя, Азерб. сял. партыя, «Новы Азербайджан», Азерб. сац.-дэмакр. партыя і інш.

**Гаспадарка**. Асн. галіны прам-сці нафтаздабыўная (11,7 млн. т; 1991), газаздабыўная (8,3 млрд. м$^3$; 1991), нафтаперапр. (вытв-сць шматлікіх відаў паліва, тэхн. маслаў і інш.). Электраэнергетыка, машынабудаванне і металаапрацоўка, хім. і нафтахім. прам-сць. Вытв-сць электраэнергіі 23,5 млрд. кВт·гадз (1991); выпрацоўваюць ЦЭС (91%), каскад ГЭС на Куры (у т.л. самая буйная Мінгечаурская), Араксінская, Шамхорская і інш. Гарнарудная прам-сць: здабыча жал. руды (1,6 млн. т), алунітаў у раёне Дашкесана. Металургічная прам-сць (вытв-сць сталі, стальных трубаў, алюмінію, пракат каляровых металаў) у Сумгаіце, Гянджы. У машынабудаванні вылучаецца вытв-сць абсталявання для нафтавай прам-сці (Баку). Развіты электратэхн., радыёэлектронная прам-сць, прыладабудаванне (асн. цэнтр Баку). Прадпрыемствы хім. і нафтахім. прам-сці выпускаюць мінер. ўгнаенні, серную кіслату, сінтэтычны каўчук, аўтапакрышкі, шкловалакно, мыйныя сродкі, лакі, фарбы і інш. (Сумгаіт, Мінгечаур, Гянджа, Нефтэчала, Сальяны). Галіны лёгкай прам-сці: баваўняная (Баку, Гянджа), шаўковая (Шэкі), шарсцяная, трыкатажная, вытв-сці дываноў (Баку, Гянджа, Мінгечаур, Шэкі), гарбарна-абутковая (Баку, Гянджа). Развіты харч. (кансервавая, тытунёвая, чайная, рыбная, вінаробная, масласыраробная, мукамольна-крупяная і інш.) прам-сць і вытв-сць

**Азербайджан.** Горад Баку.

буд. матэрыялаў (цэмент, азбестацэментавыя вырабы, буд. фаянс, камень, зборныя жалезабетонныя канструкцыі і інш.). С.-г. ўгоддзі займаюць каля 4 млн. га, з іх больш за 1,6 млн. пад ворнымі землямі, 2,1 млн. га пад летняй і зімовай пашай. Пл. зямель, якія арашаюцца, — 1,3 млн. га (1986). Найб. пасяўныя плошчы пад збожжавымі культурамі (пшаніца, рыс, азімы ячмень). Гал. тэхн. культуры — бавоўна і тытунь. Развіты пладаводства, вінаградарства. А. — база ранняга агародніцтва, буйны раён вырошчвання субтрапічных культур (гранат, інжыр, міндаль, масліны, шафран, цытрусавыя і інш.) і чаяводства. Жывёлагадоўля мяса-малочнага (буйн. раг. жывёла) і мяса-воўнавага (авечкагадоўля) кірунку. Выцв-сць мяса — 8,1 тыс. т, малака — 84,8 тыс. т (1991). Птушкагадоўля, шаўкаводства.

Транспарт. Асн. від — чыгуначны. Праз А. праходзіць чыг. магістраль у Іран (на Тэбрыз). Паводле аб'ёму перавозак на 2-м месцы марскі транспарт; гал. порт Баку, звязаны чыг. паромам з Краснаводскам. Па Куры — суднаходства. Нафтаправод Баку—Тбілісі—Батумі, газаправоды Карадаг—Гянджа—Акстафа з адгалінаваннем на Ерэван і Тбілісі, Карадаг—Баку і інш. Ажыццяўляюцца грузапасаж. авіярэйсы Мінск—Баку—Мінск. Экспарт А. складае 1,46 млрд. інвалютных руб. (1992). У знешнім гандлі А. вядучае месца належыць Расіі (60% тавараабароту). Экспартуе энерганосьбіты і энергаматэрыялы, імпартуе прадукты харчавання. Грашовая адзінка — манат.

**Узброеныя сілы** А. складаюцца з сухапутных войскаў, ВПС і ВМС. Вярх. галоўнакамандуючы — прэзідэнт. У 1993 налічвалі 41,6 тыс. чал. (560 тыс. рэзервістаў). Сухапутныя войскі (38,9 тыс. чал.) маюць 2 карпусныя групы, 1 танк. брыгаду, 9 механізаваных брыгад, 1 механізаваны полк, 2 артыл. брыгады, 2 артыл. палкі; на ўзбраенні 286 танкаў, 362 баявыя машыны пяхоты, 480 бронетранспарцёраў, ракеты класа «зямля—паветра», артылерыя, ракетныя пускавыя ўстаноўкі, 130 мінамётаў. У ВПС (1,6 тыс. чал.) на ўзбраенні 47 баявых самалётаў, 52 вучэбна-трэніровачныя самалёты. ВМС (2,1 тыс. чал.) атрымалі ч. Каспійскай ваен. флатыліі б. СССР, у т.л. 1 фрэгат, 6 вартавых караблёў. Ваенна-марская база ў Баку.

**Ахова здароўя**. На пач. 1992 было 749 бальнічных устаноў на 71,9 тыс. ложкаў (99,4 ложка на 10 тыс. ж.), 1726 амбулаторна-паліклінічных устаноў, 28,1 тыс. урачоў (38,9 урача на 10 тыс. ж.). Сярэдняя працягласць жыцця 69 гадоў. Дзіцячая смяротнасць склала 45 дзяцей на 1 тыс. народжаных.

**Асвета, навуковыя ўстановы**. У А. ажыццяўляецца ўсеагульнае абавязковае навучанне. Створана сістэма вышэйшай і сярэдняй спец. адукацыі. У 1991 у А. было 2168 дашкольных дзіцячых устаноў (173 тыс. дзяцей), 4332 агульнаадук. школы (1375 тыс. вучняў, 139 тыс. настаўнікаў), 77 сярэдніх спец. навуч. устаноў (60,1 тыс. навучэнцаў), 18 ВНУ (108 тыс. студэнтаў). Найбольшыя ВНУ: Азербайджанскі ун-т, ін-ты с.-г., політэхн., мед., пед., пед. замежных моў, мастацтваў, нафты і хіміі, буд. інжынераў, кансерваторыя і інш. Навук. даследаванні вядуцца ў 131 навук. установе (разам з ВНУ) і ў н.-д. ін-тах АН Азербайджана (у яе складзе 61 акадэмік, 74 чл.-карэспандэнты, 364 д-ры навук і 2441 канд. навук; 1990). На 1.1.1991 у А. было 4,8 тыс. масавых б-к з фондам 45,9 млн. адзінак захавання, самыя вялікія: Рэсп. б-ка імя Ахундава, Фундаментальная б-ка АН. У А. 122 музеі (разам з філіяламі), буйнейшыя з іх: Музей мастацтваў імя Мустафаева, Музей азерб. л-ры імя Нізамі, Музей гісторыі А.; 38 тыс. клубных устаноў.

**Друк, радыё, тэлебачанне**. У 1992 у А. 575 перыяд. выданняў. Найбуйнейшыя газеты: «Азербайджан», «Азадлыг» («Свабода»), «Бакинский рабочий», «Вышка», «Мухаліфат» («Апазіцыя»). Працуюць дзярж. (Азерінфарм) і пры-

Да арт. **Азербайджан**. Аджэмі ібн Абу Бекр. Маўзалей Мамінэ-хатун у Нахічэвані. 1186.

ватныя (Аса-Ірада, Туран і Хабар-сервіс) тэлегр. агенцтвы. Тэлецэнтры Бакінскі і Нахічэванскі. Радыё і тэлебачанне вядуць перадачы на азерб., арм. і рус. мовах. У Баку рэтрансліруецца праграма тур. тэлебачання.

**Літаратура.** Азерб. л-ра бярэ пачатак у фальклоры. Самыя стараж. помнікі нар.-паэт. творчасці — т.зв. мідыйскія легенды, нар. паданні (7—6 ст. да н. э.). Рэліг.-філас. погляды стараж. азербайджанцаў адлюстраваны ў помніку «Авеста». Гераічны эпас прадстаўлены паэмамі-дастанамі, сярод якіх самы значны *«Кёр-аглы»*. Рамантычныя сюжэты складаюць аснову дастанаў «Аслі і Керэм», «Ашут-Гарыб» і інш. Стваральнікамі, выканаўцамі і зберагальнікамі нар. творчасці былі спевакі-*ашугі*. Стараж. пісьмовыя помнікі не захаваліся, але ёсць звесткі, што яшчэ ў 5 ст. ў Албаніі Каўказскай існаваў алфавіт, былі напісаны арыгінальныя і перакладныя кнігі. У 7—9 ст. узмацніўся арабаэзіі пакінулі *Насімі*, Хабібі, Кішверы і інш. Пад псеўданімам Хатаі пісаў вершы заснавальнік дынастыі Сефевідаў шах Ісмаіл I. Газелі Мухамеда Фізулі — узор высокай лірыкі на ўсім Б. і Сярэднім Усходзе. З яго імем звязана канчатковае фарміраванне літ. азерб. мовы. У творах прадаўжальнікаў традыцый Фізулі (Саіба Тэбрызі, Каўсі Тэбрызі, Месіхі) паэзія набывала больш простую і арганічную форму. Гэта заўважна і ў творах лепшых паэтаў 18 ст. Мала Велі *Відадзі* і Мала Панах *Вагіфа*. Валодаючы ўсімі формамі класічнай паэзіі, яны сцвердзілі ў л-ры ашугскую форму гошма, найб. блізкую да нар. творчасці. Л-ра 19—пач. 20 ст., прадаўжаючы класічныя традыцыі, зазнала новыя павевы, ішла ад асветніцкага рэалізму А.-К.*Бакіханава* і *Вазеха* да рэалізму крытычнага. Важнае значэнне для развіцця рэаліст. л-ры мела творчасць М.Ф.*Ахундава*, талент якога найб. поўна раскрыўся ў драматургіі. У 2-й пал. 19 ст. тварылі паэт-асветнік Сеід Азім Шырвані, паэты-лірыкі Сеід Набаты, Бахар Шырвані, паэтэса Хуршудбану Натаван. У 1875 засн. першая газета на азерб. мове «Экінчы» («Араты»). На пач. 20 ст. з'явіліся раманы С.М.Ганізадэ, М.С.*Ардубады*, Н.Нарыманава, рамант. лінію ў паэзіі развівалі Абас Сіхат, Хады Мухамед і інш. У 1932 створаны Саюз пісьменнікаў А. Значны ўклад у азерб. паэзію С.*Вургуна*, С.*Рустама*, Р.*Рзы*, М.*Рагіма*, *Мюшфіка* і інш. Выдадзены раманы, аповесці і апавяданні Сеіда Гусейна, С.*Рагімава*, *Абульгасана*, Гусейна Мехты, М.Ібрагімава, А.Веліева, *Мір Джалала*, Г.Мусаева і інш. У пасляваен. гады плённа працавалі празаікі І.Гусейнаў, Б.Байрамаў, Г.Сеідбейлі, І.*Шыхлы*, Г.Абасзадэ, С.Веліеў, С.Даглы, *Анар*, А.*Айліслі*, паэты Б.Азераглу, Б.*Вагабзадэ*, Н.*Хазры*, З.Джабарзадэ, І.*Сафарлі*, Г.Гусейнзадэ, А.Керым і інш. У 1960-я г. з'явіліся псіхал. апавяданні і лірыка-псіхал. аповесці Айліслі, І.Гусейнава, М.Ібрагімбекава, Анара і інш. Раман 1960—70-х г. у асноўным арыентаваўся на паказ жыцця вяскоўцаў ці рабочых («Вузлы» С.Веліева, «Магамед, Мамед, Маміш...» Ч.Гусейнава). У 1980-я г. выдадзены раманы «Меч і пяро» Ардубады, «Калыска на жалезным дрэве» Ф.Керымзадэ, «Камяністы ключ» С.Веліева, кн. аповесцяў і апавяданняў «Залаты конь і зямля» Дж.Алібекава, «Птушынае гняздо» Дж.Рафіева, «Маніфест маладога чалавека» Мір Джалала, «Кліч» А.Мамедава, «Людзі і хвалі» Г.Гусейнаглы, зб. паэзіі «Будзь сведкам, сонца» Н.Гасанзадэ, «Снежныя кветкі» М.*Дыльбазі*, «Памяць

Да арт. **Азербайджан.** Дэталь партала палаца Шырваншахаў у Баку. Канец 15 ст.

Да арт. **Азербайджан.** Маўзалей шэйха Сефі ў Ардэбілі. 16 ст.

Да арт. **Азербайджан.** Мір Сеід Алі. Мініяцюра з рукапісу «Хамсе» Нізамі. 1539—43.

ісламскі, у 11 ст. — іранскі ўплыў на азерб. культуру. Арабская і персідская мовы сталі афіцыйнымі, на іх стваралі свае творы паэты і вучоныя Хатыб Тэбрызі, Гатран Тэбрызі. Адначасова развівалася і азерб. мова. У 10—11 ст. фарміраваўся эпас «Кітабі Дэдэ Коркуд». У 11—12 ст. побач з творамі прыдворных паэтаў з'яўляліся творы пра жыццё народа. Узоры лірыкі стваралі *Хагані Шырвані*, *Абу-ль-Ала Ганджэві*, Фелекі Шырвані, паэтэса Мехсеты Ганджэві і інш. Вяршыня азерб. паэзіі 12 ст. — творчасць *Нізамі* Ганджэві, які зрабіў вял. ўплыў і на азерб. л-ру, і на л-ры іншых народаў Усходу. У 13—14 ст. тварылі паэты Іседын Гасанаглы, Зульфігар Шырвані, Аўхеды Марагаі, Махмуд Шабустары. Значны след у паэзіі пакінулі *Насімі*, Хабібі, Кішверы і інш. Пад псеўданімам Хатаі пісаў вершы заснавальнік дынастыі Сефевідаў шах Ісмаіл I. Газелі Мухамеда Фізулі — узор высокай лірыкі на ўсім Б. і Сярэднім Усходзе. З яго імем звязана канчатковае фарміраванне літ. азерб. мовы. У творах прадаўжальнікаў традыцый Фізулі (Саіба Тэбрызі, Каўсі Тэбрызі, Месіхі) паэзія набывала больш простую і арганічную форму. Гэта заўважна і ў творах лепшых паэтаў 18 ст. Мала Велі *Відадзі* і Мала Панах *Вагіфа*. Валодаючы ўсімі формамі класічнай паэзіі, яны сцвердзілі ў л-ры ашугскую форму гошма, найб. блізкую да нар. творчасці. Л-ра 19—пач. 20 ст., прадаўжаючы класічныя традыцыі, зазнала новыя павевы, ішла ад асветніцкага рэалізму А.-К.*Бакіханава* і *Вазеха* да рэалізму крытычнага. Важнае значэнне для развіцця рэаліст. л-ры мела творчасць М.Ф.*Ахундава*, талент якога найб. поўна раскрыўся ў драматургіі. У 2-й пал. 19 ст. тварылі паэт-асветнік Сеід Азім Шырвані, паэты-лірыкі Сеід Набаты, Бахар Шырвані, паэтэса Хуршудбану Натаван. У 1875 засн. першая газета на азерб. мове «Экінчы» («Араты»). На пач. 20 ст. з'явіліся раманы С.М.Ганізадэ, М.С.*Ардубады*, Н.Нарыманава, рамант. лінію ў паэзіі развівалі Абас Сіхат, Хады Мухамед і інш. У 1932 створаны Саюз пісьменнікаў А. Значны ўклад у азерб. паэзію С.*Вургуна*, С.*Рустама*, Р.*Рзы*, М.*Рагіма*, *Мюшфіка* і інш. Выдадзены раманы, аповесці і апавяданні Сеіда Гусейна, С.*Рагімава*, *Абульгасана*, Гусейна Мехты, М.Ібрагімава, А.Веліева, *Мір Джалала*, Г.Мусаева і інш. У пасляваен. гады плённа працавалі празаікі І.Гусейнаў, Б.Байрамаў, Г.Сеідбейлі, І.*Шыхлы*, Г.Абасзадэ, С.Веліеў, С.Даглы, *Анар*, А.*Айліслі*, паэты Б.Азераглу, Б.*Вагабзадэ*, Н.*Хазры*, З.Джабарзадэ, І.*Сафарлі*, Г.Гусейнзадэ, А.Керым і інш. У 1960-я г. з'явіліся псіхал. апавяданні і лірыка-псіхал. аповесці Айліслі, І.Гусейнава, М.Ібрагімбекава, Анара і інш. Раман 1960—70-х г. у асноўным арыентаваўся на паказ жыцця вяскоўцаў ці рабочых («Вузлы» С.Веліева, «Магамед, Мамед, Маміш...» Ч.Гусейнава). У 1980-я г. выдадзены раманы «Меч і пяро» Ардубады, «Калыска на жалезным дрэве» Ф.Керымзадэ, «Камяністы ключ» С.Веліева, кн. аповесцяў і апавяданняў «Залаты конь і зямля» Дж.Алібекава, «Птушынае гняздо» Дж.Рафіева, «Маніфест маладога чалавека» Мір Джалала, «Кліч» А.Мамедава, «Людзі і хвалі» Г.Гусейнаглы, зб. паэзіі «Будзь сведкам, сонца» Н.Гасанзадэ, «Снежныя кветкі» М.*Дыльбазі*, «Памяць крыві» Сабіра, «Размова з самім сабой» Вагабзадэ і інш. Развіваецца дзіцячая л-ра (М.Сеідзадэ, М.Рзакулізадэ, Мусаеў, Х.Алібейлі і інш.), крытыка і літаратуразнаўства (Г.Араслі, Арыф, Ф.Касімзадэ, М.Рафілі, А.Султанлі і інш.).

На бел. мову перакладзены раман Ібрагімава «Настане дзень» (1953), аповесць Абульгасана «Унукі старой Тамашы» (1962), кн. аповесцяў С.Веліева «Вусаты Ага. Кулік» (1985), кн. апавяданняў «Ключ жыцця» (1978), зб. твораў дзіцячых пісьменнікаў і фальклору «Вышкі над морам» (1989), зб. вершаў і паэм М.Тофіка «Сонечны цягнік» (1986) і інш. На азерб. мову перакладзены творы Я.Купалы, Я.Коласа, М.Танка, П.Броўкі, А.Куляшова і інш.

**Архітэктура і выяўленчае мастацтва.** Ад эпохі энеаліту і ранняй бронзы на тэр. А. захаваліся дальмены, менгіры, кромлехі, з 1-га тыс. да н.э. — цыклапічныя збудаванні (Кедабекскі р-н, перадгор'і М.Каўказа, Нахічэвань). Найб. стараж. помнікі выяўл. мастацтва (2—1-е тыс. да н.э.) — наскальныя гравіраваныя малюнкі ў Кабустане, кераміка Мінгечаура, упрыгожанні з бронзы, дробная пластыка. У 9—6 ст. да н. э. будаваліся гарады, абарончыя збудаванні, жыллё т. зв. антавага тыпу, алтары агню (Мана, Мідыя). Помнікі раннесярэдневяковага дойлідства — храм у Лекіце, базіліка ў с. Кум (5—6 ст.), мячэці ў Бардзе, Гянджы, Шэмасе (7—9 ст.). З 10 ст. ствараюцца арх. школы: нахічэванская (пабудовы 12 ст. архітэктара *Аджэмі*), шырвана-апшэронская (*Шырваншахаў палац* у Баку), тэбрызская (Блакітная мячэць, 15 ст.). Найб. вядомыя помнікі 12—13 ст. — маўзалеі ў Нахічэвані і Джузе, *Дзявочая вежа* ў Баку. У 16—17 ст. пабудаваны культавыя комплексы шэйха Сефі (Ардэбіль), Гёй-Імам, цэнтр. плошча з мячэццю Джума (Гянджа) і інш. У сярэднявеччы развівалася скульптура (бронзавыя грыфоны, каменныя фігуркі), высокага ўзроўню дасягнулі вытв-сць глазураванай керамікі, разьба па камені, каліграфія. На 16 ст. прыпадае росквіт *тэбрызскай школы мініяцюры* (мастакі Султан Мухамед, Мір Сеід Алі, Бехзад і інш.). У час феад. раздробленасці (18 ст.) манум. будаўніцтва занепадае; арх.-буд. традыцыі захаваліся ў нар. дойлідстве (жылыя дамы, невял. мячэці). У 18 ст. актуалізаваўся насценны жывапіс (палац ханаў у Шэкі, жылыя дамы ў Ардубадзе, Шушы). У 19 ст. традыцыі мініяцюрнага жывапісу прадаўжаліся ў насценных размалёўках і партрэце (майстры У.Г.Карабагі, М.К.Эрывані, М.М.Наваб). Прыёмы планіроўкі і кампазіцыі, нац. арх. формы і матывы дэкору нярэдка спалучаліся з элементамі рас. і зах.-еўрап. класіцызму (Шэмаха, Баку). Заснавальнікамі рэаліст. жывапісу ў пач. 20 ст. былі А.Азімзадэ і Б.*Кенгерлі*. У 1920 у Баку адкрыта маст. школа. У 1920 — пач. 30-х г. працавалі жывапісцы А.Рзакуліеў, С.Саламзадэ, Ш.Мангасараў, графікі Э.Гаджыеў, Г.Халыкаў, І.Ахундаў, скульптары П.*Сабсай*, І.Гуліеў, Ф.Абдурахманаў, Дж.Карагды, тэатр. мастакі Р.Мустафаеў, Н.Фатулаеў. З канца 1920-х г. будуюцца першыя рабочыя пасёлкі (пас. Мамедзьярава — адзін з першых прыкладаў комплекснай забудовы жылога раёна). У выхаванні нац. кадраў у А. прымалі ўдзел рус. архітэктары (браты Весніны, А.Шчусеў і інш.). З 1930-х г. працуюць выпускнікі арх.-буд. ф-та (засн. ў 1920) Азербайджанскага політэхн. ін-та (С.*Дадашаў*, Э.*Касімзадэ*, М.*Усейнаў* і інш.). Для 1920-х г. характэрна стылізатарства пад феад. дойлідства мусульм. Усходу. У пач. 1930-х г. з'явіліся канструктывісцкія будынкі (гасцініца «Інтурыст» у Баку), у 2-й пал. 1930—50-х г. асвойвалася класічная, у т.л. нац. арх. спадчына (Музей азерб. л-ры імя Нізамі ў Баку). З канца 1950 праектуюцца і забудоўваюцца новыя гарады — Сумгаіт, Дашкесан, Мінгечаур, вядзецца рэканструкцыя Баку. Эстэтыка сучаснага этапу дойлідства А. выявілася ў архітэктуры Баку (комплекс будынкаў АН, гасцініц «Азербайджан» і «Масква», усе арх. Усейнаў; станцыі метрапалітэна, арх. Усейнаў, К.Сянчыхін, Т.Ханлараў, Ш.Зейналава, Касімзадэ і інш.; палац «Гюлістан», арх. А.Амірханаў, Н.Гаджыбекаў) і інш. гарадоў. У выяўл. мастацтве з канца 1950-х г. паглыбляецца працэс асэнсавання нац. маст. традыцый, развіваецца самабытная школа жывапісу. У 1960—80-я г. мастакі Н.Абдурахманаў, М.*Абдулаеў*, Саламзадэ, Э.Рзакуліеў, Т.*Салахаў*, Б.Мірзазадэ і інш. працуюць у гіст. і быт. жанрах, пішуць партрэты, пейзажы. Сярод сучасных мастакоў — жывапісцы Т.Нарыманбекаў, А.Джафараў, Н.Касумаў; графікі Р.Бабаеў, Ю.Гусейнаў, Э.Шамілаў, К.Алекпераў. У 1936 засн. Саюз архітэктараў, у 1940 — Саюз мастакоў А.

Да арт. **Азербайджан.** Помнік Нізамі ў Баку. Скульпт. Ф.Абдурахманаў, арх. С.Дадашаў, М.Усейнаў. 1949.

Да арт. **Азербайджан.** Помнік паэту Фізулі ў Баку. Скульпт. Т.Мамедаў, О.Эльдараў, арх. Г.Мухтараў. 1962.

Да арт. **Азербайджан.** Т.Салахаў. Жанчыны Апшэрона. 1967.

**Музыка**. На працягу многіх стагоддзяў на тэр. А. існавалі фальклн. музыка (сялянская і гарадская) і творчасць нар.-прафес. музыкантаў вуснай традыцыі, у т.л. ашугаў. Вак.-інстр. фальклор мае элементы шматгалосся. Самабытнасць гукавога строю азерб. музыкі вызначаюць 7 асн. ладоў-мугамаў (найб. пашыраны раст, шур, сегях). Сярод муз. інструментаў: струнна-смычковы кеманча, струнна-шчыпковыя тар, саз, уд; духавыя тугак, балабан, зурна; ударныя дэф (бубен), нагара, гоша-нагара. Нар. песенная творчасць разнастайная ў жанравых адносінах, з багатай метрарытмікай. Пераважае сольнае, радзей хар. (унісоннае) выканальніцтва. Мастацтва паэтаў-спевакоў ашугаў засн. на класічных мелодыях (больш за 80), кожная з якіх мае шмат імправізацыйных варыянтаў. У 11—16 ст. найб. пашырана было гар. мастацтва мугамаў — вял. цыклічных вак.-інстр. п'ес, пабудаваных у розных ладах. З канца 19 ст. ў А. пранікае еўрап. муз. культура. Асновы сучаснай азерб. прафес. муз. культуры заклаў У.*Гаджыбекаў*, які распрацаваў тэорыю азерб. ладоў, стварыў першую мугамную оперу «Лейлі і Меджнун» (1908) і муз. камедыю «Аршын мал алан» (1913). Новы стыль азерб. музыкі фарміруецца ў 1920—30-я г. найперш у оперным жанры. Пастаноўка оперы Р.Гліэра «Шахсенем» (1927) выявіла імкненне да сінтэзу еўрап. і нац. формаў, «Нэргіз» (1938) А.М.*Магамаева* — першы азерб. твор, засн. на класічных формах, опера «Кёр-аглы» (1937) У.Гаджыбекава стала нац. класікай. У 1940 паст. першы нац. балет «Дзявочая вежа» А.Бадалбейлі. Этапнымі былі балеты «Сем прыгажунь» (1952) і «Сцежкаю грому» (1958) К.*Караева*, «Легенда аб каханні» (1961) А.*Мелікава*. Муз. камедыі і аперэты стваралі С.Рустамаў, Ф.*Амірaў*, С.Алескераў, Караеў, Р.Гаджыеў. Сімф. жанр у А. ўзнік у 1920—30-я г. У ім працавалі Караеў, у творчасці якога аб'яднаны рысы нац. і сучаснай музыкі, *Ніязі*, працуюць Амірaў, С.*Гаджыбекаў*, Дж.Гаджыеў, Мелікаў, М.Мірзоеў, А.Рзаеў, А.Алізадэ, М.Куліеў, І.Гаджыбекаў, А.Дадашаў і інш.; у вак.-сімф. жанры — Рустамаў, Р.Мустафаеў, Р.Гаджыеў, Алізадэ, Н.Мамедаў, Мірзоеў і інш. Першыя ўзоры нац. раманса належаць А.Зейналы (1920-я г.). У камерна-інстр. жанрах працаваў Караеў, працуюць Амірaў, Дж.Гаджыеў, Т.Бакіханаў, С.Гаджыбекаў, Куліеў, Х.Мірзазадэ, А.Азізаў і інш. Развіваецца дзіцячая музыка, музыка для т-ра і кіно. Сярод выканаўцаў: дырыжоры Ніязі, Р.Абдулаеў; спевакі Р.*Бейбутаў*, *Бюль-Бюль*, М.*Магамаеў*, Ш.*Мамедава*, Ф.Ахмедава, Л.*Іманаў*, З.*Ханларава*, Р.Атакішыеў; піяністы Ф.Бадалбейлі, Т.Махмудава. У А. працуюць (1994): у Баку — Азерб. т-р оперы і балета (з 1920), Т-р музкамедыі (1938); філармонія (1936), у складзе якой Сімф. аркестр імя У.Гаджыбекава, Ансамбль песні і танца А., камерны аркестр, хар. капэла, ансамбль танца, Дзярж. эстрадны аркестр; Сімф. аркестр імя Ніязі, эстрадна-сімф. аркестр, аркестр нар. інструментаў, хор пры Азерб. радыё і тэлебачанні; «Тэатр песні»; у Гянджы — філармонія. Працуюць таксама кансерваторыя (з 1921), муз. вучылішчы, муз. школы. У 1934 засн. Саюз кампазітараў А.

**Тэатр**. Вытокі азерб. тэатр. мастацтва — у нар. творчасці. У стараж. А. існаваў лялечны т-р «Кілімарасы», у сярэднявеччы — рэліг.-містэрыяльны тэатр. У 1873 у Баку ўпершыню на азерб. мове паказаны камедыі М.Ахундава «Везір Ленкаранскага ханства» і «Гаджы-Кара». У 1897 арганізаваны першы прафесійны калектыў «Мусульманская драм. трупа», у пач. 20 ст. створаны тэатр. трупы пры асв. т-вах «Ніджат» і «Сафа». Значны ўклад у развіццё нац. драм. мастацтва зрабілі Дж.Зейналаў, Г.*Араблінскі*, У.Гаджыбекаў, Дж.Джабарлы, А.Шарыфзадэ, У.Раджаб і інш. У 1920 у Баку створаны аб'яднаны дзярж. т-р (азерб., рус., арм. драм. і оперныя трупы). У 1922 азерб. драм. трупа пераўтворана ў Азерб. дзярж. т-р (Азерб. акад. т-р імя Азізбекава). У рэпертуары т-ра, які прадаўжае лепшыя нац. традыцыі, п'есы нац. драматургаў, класічныя і сучасныя творы. У 1944 засн. Азерб. тэатр. т-ва. У 1994 у А. 10 драм. т-раў.

Азербайджанскі горны мерынос.

**Кіно**. Кінавытворчасць у А. пачалася з 1916, калі акц. т-ва «Фільма» выпусціла карціны «У царстве нафты і мільёнаў» і «Аршын мал алан» (1917). У 1923 у Баку створана Азерб. фотакінаўпраўленне (з 1960 кінастудыя «Азербайджанфільм» імя Дж.Джабарлы); першы маст. фільм «Легенда пра Дзявочую вежу» (1924). У 1929 арганізавана студыя для падрыхтоўкі нац. творчых кадраў. У фільмах 1920-х г. пераважалі тэмы рэвалюцыі і грамадз. вайны («Гаджы Кара», «26 камісараў»). З 1936 здымаюцца гукавыя фільмы: «Алмас», «Бакінцы», «Сын Радзімы», «Бахтыяр», «Адна сям'я». У 1960—80-я г. пашырылася тэматыка, абнавілася паэтыка фільмаў, зняты маст. фільмы: «Не тая, дык гэтая», «Чаму ты маўчыш?», «Святло згаслых вогнішчаў», «Перад зачыненымі дзвярыма»; дакумент.-хранік.: «Аповесць пра нафтавікоў Каспія» (Ленінская прэмія 1960), «Пакарыцелі мора» (сярэбраны медаль Маскоўскага міжнар. кінафестывалю 1959). У 1969 пачата вытворчасць мультыплікацыйных фільмаў. У 1965 створаны Саюз кінематаграфістаў А. Сярод дзеячаў кіно: І.Касумаў, Т.Тагізадэ, Т. Ахундаў, М. і Р.Ібрагімбекавы, Анара (А.Рзаева), А.Бабаеў, Г.Мамедаў, Г.Турабаў, Ш.Мамедава.

*Літ.*: Гаджи-заде А.М. Азербайджанский промышленный комплекс. Баку, 1975; Географический справочник: Новые цифры, факты, названия. М., 1993; Кавказ. М., 1966; История Азербайджана. Т. 1—3. Баку, 1958—63; История Азербайджана по документам и публикациям: Сб. Баку, 1990; Рахман-заде Ф. Дар судьбы. Баку, 1990; Касим-заде Ф. Очерки по истории азербайджанской литературы XIX в. Баку, 1962; Бретаницкий Л.С., Веймарн Б.В. Искусство Азербайджана IV—XVIII веков. М., 1976; Эфандиев Р. Декоративно-прикладное искусство Азербайджана. Баку, 1976; Гаджибеков У. Основы азербайджанской народной музыки. 3 изд. Баку, 1985; История музыки народов СССР. Т. 1. М., 1966; История советского драматического театра. Т. 1—4. М., 1966—68; Information please: Almanac, 1995. Boston; New York, 1995.

*В.К.Міхеева* (прырода, гаспадарка), *А.Н.Гуліеў, Г.К.Кісялёў, І.Ф.Раманоўскі* (гістарычны нарыс), *Г.В.Ратнікаў* (кіно).

**АЗЕРБАЙДЖА́Н ІРА́НСКІ**, гл. *Іранскі Азербайджан*.

**АЗЕРБАЙДЖА́НСКАЯ МО́ВА**, адна з *цюркскіх моў* (агузасельджукская падгрупа), дзярж. мова Азербайджанскай Рэспублікі (гл. *Азербайджан*). Пашырана таксама ў Грузіі, Арменіі, Дагестане, Іране, Іраку і Турцыі. З сучасных моў найб. блізкая турэцкай. Мае 4 дыялектныя групы: усх. (бакінскі, кубінскі, шэмахінскі дыялекты, мутанская і ленкаранская гаворкі), зах. (казахскі, гянджынскі, карабахскі дыялекты і айрумская гаворка), паўн. (нухінскі дыялект і закатальска-кахская гаворка), паўд. (нахічэванскі, ардубадскі, таўрызскі дыялекты і ерэванская гаворка). Адрозненні ў дыялектах закранаюць пераважна фанетыку і лексіку. Літ. А.м. развіваецца з 13 ст. (аснова — шэмахінскі і бакінскі дыялекты).

У фанет. сістэме 9 галосных фанем, 23 зычныя. У марфалогіі 9 часцін мовы, у т.л. паслялогі. У сінтаксісе развіта сістэма злучнікавых складаных сказаў. Пісьменства да 1929 на аснове араб. графікі, у 1929—39 на аснове лац. алфавіта, з 1939 на аснове рус., з 1991 — лац. графікі.

**АЗЕРБАЙДЖА́НСКІ ГО́РНЫ МЕРЫНО́С**, парода танкарунных авечак воўнавага кірунку. Выведзена ў 1935—47 у гаспадарках Азербайджана скрыжаваннем малапрадукцыйных мерыносавых авечак з баранамі асканійскай і каўказскай танкарунных парод, а таксама помесяў мясц. грубашэрсных авечак пароды базах з танкарунными баранамі. Шырока выкарыстоўваюць для паляпшэння шэрсных якасцяў мясц. авечак.

Жывёлы рухавыя, трывалыя, добра прыстасаваныя да пашавага ўтрымання ў горных ра-

ёнах. Маюць моцны касцяк, дужыя ногі, развітую грудную клетку з вял. аб'ёмам лёгкіх; скура тлустая, шчыльная, без складак. Жывая маса бараноў 70—80 (да 100) кг, матак 45—50 (да 70) кг. Воўна 64—70-й якасці, даўж. 7,5—9 см. Гадавы настрыг воўны з бараноў 8—10 кг, з матак 4,5—5 кг. Выхад чыстай воўны 42—45%. Пладавітасць 112—120%.

**АЗЕРБАЙДЖА́НЦЫ** (саманазва азербайджанлылар, азерылер), нацыя, асн. насельніцтва *Азербайджана* (5,8 млн. чал., 1989). Агульная колькасць у свеце больш за 14,55 млн. чал. (1987). У краінах СНД 6,7 млн. чал., жывуць таксама ў Іране і Іраку. Гавораць на *азербайджанскай мове*. Вернікі пераважна мусульмане-шыіты.

**АЗЁ́РЦЫ**, вёска ў Беларусі, у Талачынскім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «XVIII партз'езд». За 6 км на ПнУ ад Талачына, 115 км ад Віцебска, 5 км ад чыг. ст. Талачын, на шашы Мінск—Масква. 742 ж., 290 двароў (1994). Кансервавы з-д. Базавая школа. Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі, камбінат быт. абслугоўвання.

**АЗЁ́РШЧЫНА**, вёска ў Беларусі, у Рэчыцкім р-не Гомельскай вобл., на р. Дняпро. Цэнтр сельсавета і Рэчыцкага саўгаса-тэхнікума. За 10 км на ПнЗ ад горада і чыг. ст. Рэчыца, 60 км ад Гомеля. 4858 ж., 1800 двароў (1994). Суднабуд.-суднарамонтны з-д, ПМК. Сярэдняя школа, ПТВ, 3 б-кі, 3 клубы, амбулаторыя, 2 аддз. сувязі, камбінат быт. абслугоўвання. Царква. За 0,3 км на З ад вёскі паселішча каменнага веку.

**АЗЁ́Ф** Еўна Фішалевіч (1869, г. Гродна—1918), адзін з арганізатараў і лідэраў партыі *эсэраў*, сакрэтны супрацоўнік (з 1892) дэпартамента паліцыі. У 1903 фактычна ўзначаліў «баявую арг-цыю» партыі эсэраў, кіраваў падрыхтоўкай тэрарыст. актаў. Выдаў паліцыі з'езд прадстаўнікоў партыі ў Харкаве (1901), амаль увесь склад «баявой арг-цыі» (1905). Па даносе А. пакараны смерцю 7 яе членаў. У 1908 А. выкрыты і прыгавораны ЦК партыі да смяротнага пакарання, але ўцёк за мяжу. Памёр у Берліне.

**АЗЁМША** Іван Паўлавіч (1851, в. Лучыцы Петрыкаўскага р-на Гомельскай вобл. — 1916), бел. нар. казачнік. У рэпертуары А. паданні, легенды, казкі, апавяданні на фантаст. і касмаганічныя сюжэты. Яго цікавілі пытанні пра стварэнне свету і чалавека, пра душу, замагільнае жыццё і г.д. Яркай гутарковай мовай расказваў сатыр. бытавыя казкі, у якіх маляваў каларытныя вобразы зайздроснага папа, прагнага багацея і спрытнага мужыка («Мужык, пан і ксёндз», «Завідны поп», «Завісны багатыр», «Вада памагла», «Хаўрус» і інш.). З 80 твораў у кн. А.К. Сержпутоўскага «Казкі і апавяданні беларусаў-палешукоў» (1911) 32 запісаны ад А.

**АЗЁРАЗНАЎ́СТВА**, лімналогія, галіна *гідралогіі*; навука пра кантынентальныя вадаёмы запаволенага водаабмену (азёры, вадасховішчы, сажалкі). Вывучае комплекс узаемазвязаных фіз., хім. і біял. працэсаў у вадаёмах; даследуе азёрныя катлавіны, донныя адклады, водны баланс і рэжым узроўню, тэрміку, лядовыя і аптычныя з'явы, гідрахімію, рух азёрнай вады, берагі, рыбапрадукцыйнасць і інш. Выкарыстоўвае метады геахіміі, геафізікі, геалогіі, гідрабіялогіі, вынікі лабараторных аналізаў станцый і пастоў сістэмы Гідраметслужбы, аэрафотаздымку.

Заснавальнік навуковага А. — швейц. вучоны Ф.А.Фарэль (1885; працы па тэорыі і методыцы А.). У развіцці А. вял. значэнне маюць працы рус. вучоных Дз.М.Анучына (вывад аб сувязі азёраў з усімі кампанентамі ландшафтаў), Л.С.Берга (апісанні азёраў Зах. Сібіры, Аральскага, Ісык-Куля) і А.І.Ваейкава (выявіў сувязь вагання ўзроўню вял. азёраў з іх водным балансам і інш.). На Беларусі першыя гідралагічныя даследаванні азёраў праведзены А.М.Семянтоўскім (у 1872 апублікаваў гідралагічны агляд Віцебскай губ.).

Сістэматычнае вывучэнне азёраў пачалося з арганізацыі н.-д. станцыі рыбнай гаспадаркі (1928). Комплексныя даследаванні азёраў праводзяцца на біял. і геагр. ф-тах БДУ (складанні азёрнага кадастру, прыродна-гасп. класіфікацыі, стварэнне ахоўных тэрыторый на базе азёраў), выконваюцца маніторынгавыя даследаванні па міжнар. праграме «Чалавек і біясфера». Н.-д. лабараторыя азёразнаўства БДУ (з 1968) комплексна даследавала больш як 500 азёраў і 20 вадасховішчаў (вывучаны гісторыя развіцця ў галацэне, вызначана іх генетычная прыналежнасць, законы азёрнай седыментацыі; В.П.Якушка). У ін-тах геал. навук і праблем выкарыстання прыродных рэсурсаў і экалогіі АН Беларусі вывучаюцца азёры як аб'екты намнажэння сапрапеляў. У вытв. мэтах азёры і вадасховішчы даследуюцца ў Цэнтр. НДІ комплекснага выкарыстання водных рэсурсаў. Вынікі даследаванняў улічваюцца ў рыбнай гаспадарцы, энергетыцы, курортнай справе, водазабеспячэнні, меліярацыі, здабычы карысных выкапняў і інш. *В.П.Якушка.*

**АЗЁРНА-РАЧНЫ́Я РЫ́БЫ**, віды рыб, аднолькава характэрныя для іхтыяфауны азёраў і рэк. Пашыраны па ўсіх мацерыках, акрамя Антарктыды. На Беларусі 24 віды: *акунь звычайны*, *аўсянка*, бычок-падкаменшчык (гл. *Падкаменшчыкі*), *верхаводка*, *вугор еўрапейскі*, *гарчак*, *гусцяра*, *джгір звычайны*, *жэрах*, колюшкі (2 віды), *карась*, *лешч*, *лінь*, *мянтуз*, *плотка*, *пячкур*, *сом звычайны*, *судак*, *уюн*, *краснапёрка*, *шчупак*, *шчыпоўка*, *язь*. Большасць маюць прамысл. значэнне.

**АЗЁРНА-ТАВА́РНАЯ РЫ́БНАЯ ГАСПАДА́РКА**, арганізацыйна-гасп. форма вядзення рыбнай гаспадаркі на натуральных вадаёмах. Асн. задачы: максімальнае змяншэнне колькасці драпежных (*шчупак* і вял. *акунь звычайны*) і малакаштоўных рыб (не менш як 80% запасу); зарыбленне вадаёмаў каштоўнымі відамі рыб (*сазан*, *карп*, *пелядзь*, *карась*, *амуры*, *таўсталобікі*, *судак*, *вугор еўрапейскі* і інш.) у адпаведнасці з іх асаблівасцямі і падрыхтаванасцю; тэхн. і біял. меліярацыя; рацыянальны адлоў таварнай рыбы; арганізацыя барацьбы з браканьерствам, забруджваннем вадаёмаў прамысл. і быт. сцёкамі, ядахімікатамі і інш. Таварную рыбу вырошчваюць на натуральных і штучных кармах. На Беларусі існуе з 1970-х г. Выхад прадукцыі з 1 га воднай пл. зарыбленых вадаёмаў да 50—600 кг, з незарыбленых 10—12 кг.

**АЗЁРНАЯ КАТЛАВІ́НА**, паніжэнне зямной паверхні, запоўненае вадой (возера, сажалка, вадасховішча), замкнёнае або адкрытае (калі праз яго цячэ рака). У А.к. вылучаюць надводную (схілы і

Лоўля рыбы ў Браслаўскай азёрна-таварнай рыбнай гаспадарцы.

берагі) і падводную часткі. Частка катлавіны, запоўненая вадой, наз. *азёрнай чашай*.

Узнікаюць А.к. ад уздзеяння ўнутр. і знешніх працэсаў, а таксама антрапагеннай дзейнасці. Падзяляюцца на тэктанічныя, ледавіковыя, тэрмакарставыя, карставыя, суфазійныя, ліманныя, завальныя (плацінныя), старычныя (поймавыя) і інш.

**АЗЁРНАЯ ПЯЧО́РА**, гіпсавая пячора на З *Падольскага ўзвышша*, на Украіне. Даўж. каля 80 км. Уяўляе сабой двухпавярховы лабірынт. Ёсць пастаянныя праточныя азёры з мінералізаванай вадой. Характэрны *сталактыты* і *сталагміты*, трапляюцца *ааліты*. Аб'ект турызму.

**АЗЁРНАЯ РУДА́**, карысныя выкапні ў расолах і донных адкладах азёраў і балот. Можа быць вадкая і цвёрдая. Вадкая — растворы калій-натрыевых соляў бясцёкавых азёраў сухіх і гарачых абласцей, воды азёраў з павышанай канцэнтрацыяй літыю. Цвёрдая А.р. — донныя асадкі гідравакісаў жалеза, якія залягаюць у выглядзе пластоў, праслоек, жаўлакоў, лінзаў, магутнасцю ад некалькіх сантыметраў да 2—3 м. Прамысл. значэння не мае.

**АЗЁРНАЯ ЧА́ША**, азёрнае ложа, частка *азёрнай катлавіны*, запоўненая вадой да вышыні макс. падымання ўзроўню. У А.ч. вылучаюць мелкаводную частку — *літараль* і *сублітараль* да глыбіні, дзе назіраецца ўплыў хваляў на дно. Глыбакаводная зона — *прафундаль* — укрыта глеямі і сапрапелямі. Форма і памеры А.ч. на працягу геал. перыяду мяняюцца ў выніку намнажэння *азёрных адкладаў*.

**АЗЁРНЫ**, пасёлак у Беларусі, у Кліноцкім с/с Чэрвеньскага р-на Мінскай вобл., на р. Волма. Цэнтр рыбгаса «Волма». За 25 км на З ад г. Чэрвень, 50 км ад Мінска і чыг. ст. Мінск. 395 ж., 157 двароў (1995). Базавая школа, Дом культуры, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Музей польскага кампазітара С. Манюшкі, помнік на месцы б. сядзібы Убель, дзе нарадзіўся кампазітар.

**АЗЁРНЫ**, пасёлак у Беларусі, у Юркевіцкім с/с Жыткавіцкага р-на Гомельскай вобл. Цэнтр доследнага рыбгаса «Белае». За 35 км ад Жыткавічаў, 268 км ад Гомеля, 17 км ад раз'езда Дзедаўка. 308 ж., 102 двары (1995). Дом культуры, бібліятэка.

**АЗЁРНЫЯ АДКЛА́ДЫ**, асадкавыя ўтварэнні на дне азёраў сучаснай і мінулых геал. эпох. Прадстаўлены пераважна дробназярністымі тэрыгеннымі асадкамі, *сапрапелем* і *дыятамітам* у прэснаводных азёрах, карбанатамі, сульфатамі, хларыдамі, глінай — у салёных. На Беларусі найб. пашыраны пясчана-гліністыя асадкі і стужачныя гліны азёрна-ледавіковых басейнаў антрапагену, сучасныя аргана-мінер. адклады (глеі і сапрапелі), карбанатныя пароды (азёрныя мергелі) і інш. Многія з іх карысныя выкапні; выкарыстоўваюцца на ўгнаенне, як лекавыя гразі, для вытворчасці будматэрыялаў і інш.

**АЗЁРНЫЯ ЗАКА́ЗНІКІ**, разнавіднасць *гідралагічных заказнікаў*, прызначаных для захавання і аднаўлення каштоўных у навук. адносінах азёраў і прылеглых да іх прыродных комплексаў. На тэр. А.з. Беларусі забаронены забор вады для гасп. мэтаў, скідванне сцёкавых водаў і бытавых адходаў, правядзенне гідрамеліярац. работ, прамысл. лоў рыбы, знішчэнне прыбярэжнай і воднай расліннасці, турызм і інш. формы арганізаванага адпачынку, выкарыстанне і мыццё маторнага транспарту, узворванне зямель у прыбярэжнай паласе. На тэр., што прылягаюць да А.з., могуць забараняцца правядзенне гасп. работ, размяшчэнне новых і функцыянаванне наяўных прадпрыемстваў, якія негатыўна ўздзейнічаюць на стан прыроднага комплексу заказніка. На Беларусі 7 А.з., усе ў Віцебскай вобл.: *Белае*, *Вялікае Астравіта*, *Глыбокае-Чарбамысла*, *Доўгае*, *Крывое*, *Рычы*, *Сосна*.

Да арт. Азёры. Возера Клухорскае на Каўказе.

Да арт. Азёры. Возера Воласа Паўночны ў Беларусі.

Да арт. Азёры. Возера ў позняй стадыі зарастання.

**АЗЁРНЫЯ РЫ́БЫ**, рыбы, характэрныя толькі для іхтыяфауны азёраў. На Беларусі да азёрных абарыгенных відаў належаць *рапушка*, *корушка*, гальян азёрны, да акліматызаваных — сіг чудскі, умоўна *пелядзь*, *сомік амерыканскі*. Большасць мае прамысл. значэнне.

**АЗЁРСКАЯ ПАПЯРО́ВА-КАРДО́ННАЯ ФА́БРЫКА**. Заснавана да 1809 у мяст. Азёры Гродзенскага пав. (цяпер вёска ў Гродзенскім р-не). Вырабляла друкарскую паперу розных гатункаў, простую з рыззя, абгортачную і кардон з драўніннай масы. У 1876 працавала 108, у 1881 — 21 рабочы. У 1884—90 мела 2 паравыя машыны, з 1890 — папяровую машыну.

**АЗЁРСКАЯ СУКО́ННАЯ МАНУФАКТУ́РА**. Дзейнічала ў 1808—70 у мяст. Азёры Гродзенскага пав. (цяпер вёска ў Гродзенскім р-не). У 1858 працавалі 55, у 1864 — 124 рабочыя.

**АЗЁРЫ**, прыродныя вадаёмы, запоўненыя ў межах *азёрнай чашы* (ложа) вадой, якія не маюць непасрэднага злучэння з морам. Пл. А. зямнога шара каля 2,7 млн. км$^2$. Найб. А.: Каспійскае (1371 тыс. км$^2$), Верхняе ў Паўн. Амерыцы (82,4 тыс. км$^2$), Вікторыя ў Афрыцы (68 тыс. км$^2$). Самае глыбокае воз. Байкал (1620 м). Размешчаны на розных вышынях: Харпа (Арпорт) у Тыбеце на выш. 4400 м, Мёртвае м. ў Зах. Азіі на 392 м ніжэй за ўзр. акіяна. У залежнасці ад умоў утварэння азёрнага ложа вылучаюць тыпы А.: плацінныя (рачныя, далінныя і прыбярэжныя, таксама штучныя А.-*вадасховішчы*); катлавінныя (карставыя, тэрмакарставыя, дэфляцыйныя, вулканічныя і тэктанічныя) і мяшанага паходжання. Паводле характару воднага балансу вызначаюць А. сцёкавыя і бясцёкавыя, адносна тэрмічнага рэжыму — умераныя, трапічныя і палярныя, адпаведна з хім. саставам вады — прэсныя, саланаватыя і салёныя, А. па ступені развіцця арган. жыцця — алігатрофныя, эўтрофныя, дыстрофныя. Форма, памеры і ўзровень А. значна мяняюцца з часам у выніку намнажэння адкладаў, змены контураў берагоў, балансу вільгаці. На Беларусі налічваецца каля 10 800 А. Сумарная пл. амаль 2000 км$^2$, агульны аб'ём вады

6—7 км³. Самае вял. па пл. воз. *Нарач* (80 км²); самае глыбокае *Доўгае возера* (глыб. 53,7 м). Размешчаны А. ў асноўным на Пн (Бел. Паазер'е) і на Пд (Палессе).

Утварэнне большасці А. Бел. Паазер'я звязана з дзейнасцю паазерскага ледавіка і яго талых водаў. Катлавіны ледавіковых А. разнастайныя: падпрудныя (Нарач, Асвейскае, Мядзел, Лукомскае), утвораны ў выніку намнажэння талых ледавіковых водаў у паніжэннях паміж марэннымі градамі; лагчынныя (Саро, Сянно, Балдук і інш.), узніклі ад ледавіковага выворвання і эразійнай дзейнасці талых водаў; эварзійныя (Рудакова, Вісяты, Жанно), выбіты сілай ледавіковай вады, якая вадаспадам сцякала з ледавіка; тэрмакарставыя (Лісіцкае, Усомля, Канашы), утвораны ў выніку раставання пахаваных лінзаў лёду. На Палессі азёрныя катлавіны пераважна старычныя, карставыя (Вулька, Сомінскае), А.-разлівы (Чырвонае, Алтушскае).

У водным жыўленні А. Беларусі пераважаюць паверхневы прыток і атмасферныя ападкі, роля падземных водаў малапрыкметная. Характэрны дадатны баланс воднага жыўлення і нязначнае ваганне ўзроўню. Прыродныя ўмовы спрыяюць фарміраванню разнастайнасці расліннага і жывёльнага свету А.

А. выкарыстоўваюцца як крыніцы і збіральнікі быт. і прамысл. вады, для рыбалоўства і рыбагадоўлі, з'яўляюцца рэгулятарамі рачных і падземных водаў, назапашвальнікамі арган. сыравіны (*сапрапеляў*), асобныя — басейнамі-ахаладжальнікамі ДРЭС. А. — мясціны для адпачынку, санаторна-курортнага лячэння, турызму. Некаторыя ахоўваюцца як заказнікі: Белае ў Брэсцкай, Міжазёрны ў Віцебскай, Мазырскія яры ў Гомельскай, Свіцязянскі і Азёры ў Гродзенскай, Блакітныя азёры ў Мінскай абласцях. Вывучае А. *азёразнаўства*.

*В.П.Якушка.*

**АЗЁРЫ**, вёска ў Беларусі, у Гродзенскім р-не, на паўд. беразе воз. Белае. Цэнтр сельсавета і калгаса «Азёры». За 25 км на У ад Гродна, 10 км ад чыг. ст. Жытомля. 4306 ж., 1768 двароў (1994).

Упершыню згадваюцца ў 1398 як «двор Вітаўта». У 15—17 ст. велікакняжацкае ўладанне, цэнтр воласці Гродзенскага пав. У 1518 упамінаецца як мястэчка. У пач. 19 ст. засн. *Азёрская папярова-кардонная фабрыка* і *Азёрская суконная мануфактура*, у 1895 — гарбарнае прадпрыемства. У 1897 — 3283 ж. У 1921—39 у складзе Польшчы. З 1939 у БССР. У 1940—62 у Скідзельскім р-не. У 1940—55 гар. пасёлак.

Акц. т-ва «Гродзенская зверагаспадарка». Сярэдняя і музычная школы, школа-інтэрнат, Дом культуры, б-ка, бальніца, аддз. сувязі, камбінат быт. абслугоўвання. Царква і касцёл. Каля вёскі стаянкі эпохі мезаліту, неаліту (*нёманская культура*) і бронзавага веку.

**АЗІ́ДЫ**, хімічныя злучэнні, вытворныя азоціставадароднай кіслаты $HN_3$. Неарганічныя А. — $X(N_3)_n$, дзе X — метал, n — ступень яго акіслення, пры трэнні, награванні раскладаюцца з выбухам (акрамя А. шчолачных і шчолачна-зямельных металаў). Атрымліваюць узаемадзеяннем соляў металаў з $NaN_3$. Арганічныя А. — алкіл- і арылазіды $RN_3$ і ацылазіды $RC(O)N_3$ узрываюцца пры награванні, лёгка адшчэпліваюць азот, пры гэтым ацылазіды перагрупоўваюцца ў *ізацыянаты*. Атрымліваюць узаемадзеяннем $NaN_3$ з галагенвытворнымі аліфатычных і араматычных злучэнняў. Неарган. А. цяжкіх металаў выкарыстоўваюцца як ініцыіруючыя выбуховыя рэчывы, арган. А. — паўпрадукты арган. сінтэзу, гербіцыды (азіпратрын).

**АЗІЗ НЕСІ́Н** (Aziz Nesin; сапр. Нусрэт Махмуд; н. 20.12.1915, г. Стамбул), турэцкі пісьменнік. Заснавальнік жанру паліт. сатыры ў тур. л-ры. Аўтар зб-каў апавяданняў «Слон па мянушцы Хамдзі» (1955), «Вар'яты на волі» (1957), «Няхай жыве Айчына» (1975), «Вітаю цябе, маё сямідзесяцігоддзе» (1984), раманаў «Кароль футбола» (1957), «Зюбюк» (1961), зб. казак «У некаторым царстве» (1958), п'ес з філас.-этычнай праблематыкай «Ідзіце сюды!» (1962), «Дуэт адной жанчыны» (1979) і інш. Творы адметныя вострай сац.-паліт. праблематыкай; спалучаюць іншасказанні, супастаўленні, камічнае пераасэнсаванне з гіпербалізацыяй і гратэскам. Шырокую вядомасць набыў пасля прысуджэння італьян. літ. прэміі «Залатая пальмавая галіна» (1956, 1957).

*Тв.*: Рус. пер. — Избр. произв. М., 1985.

**АЗІ́ЛЬСКАЯ КУЛЬТУ́РА**, археалагічная культура плямёнаў раннята *мезаліту* (у асн. 8-е тыс. да н.э.), якія насялялі тэр. паўд. Францыі і паўн. ч. Піранейскага п-ва. Назва ад пячоры Мас-д'Азіль у дэпартаменце Ар'еж (Францыя), дзе ў 19 ст. даследаваны 2 стаянкі. Узнікла на аснове папярэдняй культуры *мадлен*. Насельніцтва займалася паляваннем, рыбалоўствам, збіральніцтвам. Для А.к. характэрны дробныя крамянёвыя прылады (мікраліты), невял. гарпуны з касцей высакароднага аленя і т.зв. азільскія галькі з умоўнымі малюнкамі чырв. вохрай.

**А́ЗІМАЎ** (Asimov) Айзек (2.1.1920, в. Пятровічы Шумяцкага р-на Смаленскай вобл. — 6.4.1992), амерыканскі пісьменнік. Праф. біяхіміі Бостанскага ун-та (з 1979). У 1923 сям'я эмігравала ў ЗША. Вядомасць А. прынеслі аповесці і зб-кі апавяданняў пра робатаў («Я, робат», 1950; «Робаты і імперыя», 1985; «Мары робата», 1986, і інш.), раманы серыі «Канец станаўлення» («Станаўленне», 1951; «Станаўленне ў небяспецы», 1982; «Станаўленне і Зямля», 1986, і інш.) пра галактычную гісторыю чалавецтва, раманы «Канец вечнасці» (1955) і «Самі багі» (1972) — перасцярога ад бяздумнага ўмяшання ў законы развіцця прыроды і чалавецтва, навук.-папулярныя кнігі («Жыццё і энергія», 1962; «Сцісłая гісторыя біялогіі», 1965; «Нейтрына», 1966, і інш.). Яго творам уласцівыя займальнасць, дакладнае абгрунтаванне навук. дапушчэнняў, уменне спалучыць навук. і фантастычнае.

*Тв.*: Mind transfer. New York, 1988; Рус. пер. — Конец вечности; Сами боги. М., 1990; Основание; Основание и Империя; Второе основание: Романы. Мн., 1992; Камешек в небе. Мн., 1993.

**АЗІ́МАЯ СО́ЎКА** (Agrotis segetum), насякомае атрада матылёў. Пашырана ў Еўразіі, Афрыцы, Аўстраліі.

Размах крылаў 4—5 см. Пярэднія крылы шэрыя або амаль чорныя з плямамі, заднія — белыя. Актыўныя ўначы. Самка вельмі пладавітая, адкладвае больш за 2 тыс. яец. Матылькі жывяцца нектарам кветак, сокам раслін, вусені — травяністымі раслінамі. Шкоднікі с.-г. культур: псуе высеянае зерне азімых злакаў, шкодзіць руні, кукурузе, сланечніку, бавоўніку і інш. раслінам.

**АЗІМЗАДЭ́** Азім Аслан аглы (7.5.1880, с. Наўханы каля Баку — 15.6.1943), азербайджанскі мастак. Нар. мастак Азербайджана (1927). Заснавальнік азерб. сатыр. графікі. Аўтар серый малюнкаў, карыкатур, станковых акварэляў, якія адлюстроўваюць жыццё, по-

Да арт. Азёры. Бабровіцкае возера ў Беларусі.

быт, звычаі азерб. народа («Хаджы ў розных жыццёвых выпадках», 1915, «100 тыпаў дарэвалюцыйнага Баку», 1937). У гады Айч. вайны ствараў паліт. карыкатуры і плакаты.

**А́ЗІМУТ** (ад араб. ас-сумут шляхі) нябеснага свяціла або зямнога прадмета, вугал паміж плоскасцю мерыдыяна пункта назірання і верт. плоскасцю, якая праходзіць праз гэты пункт і свяціла ці прадмет. Адлічваецца ад напрамку на Пн па гадзіннікавай стрэлцы (0°—360°). Адрозніваюць А. астранамічны (сапраўдны), утвораны плоскасцю астранамічнага мерыдыяна, што праходзіць праз лінію адвеса ў пункце назірання; геадэзічны — плоскасцю, якая праходзіць праз нармаль да зямнога эліпсоіда; магнітны — плоскасцю магнітнага мерыдыяна. А. — адна з каардынат сістэмы гарызантальных каардынат у астраноміі; вымяраецца вугламерным інструментам (тэадалітам і інш.). Магнітны А. адрозніваецца ад сапраўднага на велічыню схілення магнітнай стрэлкі.

**АЗІ́МЫЯ КУЛЬТУ́РЫ**, аднагадовыя расліны, якім для нармальнага развіцця неабходна працяглае ўздзеянне нізкай тэмпературы на раннім перыядзе росту.

Сеюць увосень, ураджай збіраюць у наступным годзе. Маюць перыяды актыўнай вегетацыі: асенні (45—50 сут), у час якога расліны фарміруюць каранёвую сістэму і надземныя вегет. органы, і вясна-летні (75—100 сут), калі развіваюцца генератыўныя органы. Выспяваюць раней і даюць больш стабільны ўраджай, чым *яравыя культуры*, лепш пагнашаюць веснавую вільгаць з глебы; добрыя папярэднікі для інш. палявых культур. Да А.к. належаць азімыя жыта, пшаніца, ячмень, рапс, свірэпіца, рыжык, віка. У сусв. земляробстве найб. пашырана азімая пшаніца — гал. збожжавая расліна Еўропы і ЗША. На Беларусі вырошчваюць азімыя жыта, пшаніцу, віку, рапс.

**А́ЗІН** Уладзімір Марцінавіч (8.10.1895, в. Мар'янава Полацкага р-на — 18.2.1920), ваенны дзеяч. Скончыў Полацкае рэальнае вучылішча. Працаваў у Рызе, Полацку. З 1916 у арміі. На чале батальёна, Арскай групы, зводнай і стралк. дывізій змагаўся супраць белагвардзейцаў і белачэхаў, войскаў Калчака на Урале, Дзянікіна пад Царыцынам, у Сальскіх стэпах, на Доне і інш. 17.2.1920 узяты ў палон і пасля катаванняў павешаны ў станіцы Ціхарэцкай. У Полацку помнік А.

*Літ.*: Тараткевіч М. Уладзімір Азін. Мн., 1971.

**А́ЗІНА**, вёска ў Беларусі, у Полацкім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Белае». За 18 км на ПнЗ ад Полацка, 115 км ад Віцебска, 5 км ад чыг. ст. Баравуха 1-я. 743 ж., 347 двароў (1994). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі, камбінат быт. абслугоўвання. Музей У.М.Азіна. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан.

**АЗІ́НЫ**, 1) шасцічленныя *гетэрацыклічныя злучэнні*, у цыкле якіх ёсць хоць бы адзін атам азоту. Могуць уключаць інш. гетэраатамы ці быць кандэнсаванымі з інш. цыкламі. Адрозніваюць монаазіны (з адным атамам азоту, напр., *пірыдзін*, *хіналін*), дыазіны (з двума атамамі азоту; пірымідзін), *трыязіны* — цыянуравая кіслата. А. — злучэнні з араматычнымі ўласцівасцямі, утвараюць солі з кіслотамі. Вытворныя А. уваходзяць у састаў нуклеінавых кіслот, вітамінаў групы В, фарбавальнікаў. Выкарыстоўваюцца як тэрапеўт., псіхатропныя сродкі (аміназін, люмінал, сульфадымезін і інш.). 2) Вытворныя *гідразіну* агульнай формулы $RR^1C{=}N{-}N{=}CR^1R$.

**А́ЗІЯ** (грэч. Asia, напэўна ад асірыйскага асу усход), самая вялікая па плошчы (каля 43,4 млн. км$^2$) частка свету.

Азімая соўка і яе вусень.

Размешчана ў паўн. ч. Усх. паўшар'я. Крайнія пункты А.: на Пн мыс Чэлюскін, 77°43' паўн. ш.; на Пд мыс Піяй, 1°16' паўн. ш.; на З мыс Баба 26°10' усх. д.; на У мыс Дзяжнёва, 169°40' зах. д. Разам з *Еўропай* утварае адзін мацярык Еўропы—Азіі. Мяжа на сушы паміж А. і Еўропай праходзіць па ўсх. падножжы Уральскіх гор, р. Эмба, паўн. беразе Каспійскага мора, Кума-Манычскай упадзіне, Чорным м., праліве Басфор, Мармуровым м. і праліве Дарданелы. З Афрыкай злучана Суэцкім перашыйкам, ад Паўн. Амерыкі аддзелена Берынгавым пралівам. На Пн

У.М.Азін.

абмываецца Паўн. Ледавітым, на У — Ціхім, на Пд — Індыйскім акіянамі і іх ускраіннымі морамі. На З унутр. моры Атлантычнага ак. — Міжземнае і Эгейскае — абмываюць п-аў М.Азія. Берагі А. горныя і нізінныя намыўныя, падняты тэрасаваныя і апушчаныя (інгрэсіўныя). На У астраўным узбярэжжам характэрны вулканічныя рысы, берагам трапічных мораў — каралавыя рыфы. Паўастравы займаюць 8 млн. км$^2$, астравы — 2,5 млн. км$^2$. На Пн А. п-вы Ямал, Таймыр; на У — Чукоцкі, Камчатка, Карэя; на Пд — Індакітай з Малакай, Індастан, Аравійскі; на З — М.Азія. У Паўн. Ледавітым ак. а-вы Паўн. Зямля, Новасібірскія, Урангеля; у Ціхім — а-вы і ланцугі вял. а-воў: Курыльскія, Сахалін, Японскія, Рукю, Тайвань, Філіпінскія. На Пд А. в-аў Шры-Ланка і Малайскі архіпелаг; на З у Міжземным м. в-аў Кіпр. Найб. аддаленасць унутр. раёнаў А. ад акіянаў 2—2,5 тыс. км. Прыродныя раёны: Паўн. А., Усх. А., Цэнтр., Сярэдняя А., Паўд. А. і Зах. А. (пра кожны гл. асобны арт.).




Да арт. Азімут. А — азімут сапраўдны; Д — магнітнае схіленне; Ам — азімут магнітны.

**Рэльеф.** А. — узвышаная ч. свету (сярэдняя выш. 950 м). Пераважаюць горы і пласкагор'і, якія займаюць 75% тэр. У А. знаходзяцца найвыш. горныя сістэмы (выш. многіх хрыбтоў у Цэнтр. А. больш за 5000—7000 м) і вяршыня свету — 8848 м, Джамалунгма, або Эверэст, у Гімалаях. Горы А. ўтвараюць 2 вял. паясы: адзін выцягнуўся ў субшыротным напрамку ад Пярэднеазіяцкіх нагор'яў да хрыбтоў Індакітая і а-воў Малайскага архіпелага і ўключае Таўр, Каўказ, Загрос, Капетдаг, Сулейманавы горы, Гіндукуш, Памір, Каракарум, Тыбет, Гімалаі, горы М'янмы, Суматры і Явы. На У ад яго адыходзяць горныя хрыбты Куньлунь, Наньшань і Цыньлін. Другі пояс гор цягнецца з ПдЗ на ПдУ ад Цянь-Шаня да Чукоткі і ўключае Алтай, Саяны, горы Забайкалля, Станавы хр., Джугджур, Калымскае і

# АЗІЯ, ПАЛІТЫЧНАЯ КАРТА

Лічбамі на карце пазначаны:
1 Эстонія
2 Балгарыя
3 Грэцыя
4 Грузія
5 Арменія
6 Азербайджан
7 Туркменістан
8 Узбекістан
9 Кыргызстан
10 Таджыкістан
11 Сірыя
12 Ліван
13 Палесціна
14 Ізраіль
15 Іарданія
16 Кувейт
17 Бахрэйн
18 Катар
19 Аб'яднаныя Арабскія Эміраты
20 Бутан
21 КНДР
22 Карэя
23 Джыбуці
24 Бруней
25 Сінгапур
ГРЭНЛАНДЫЯ (Дан.)
ІСЛАНДЫЯ
РЭЙК'ЯВІК
Паўночны полюс
ПАЎНОЧНЫ ЛЯДОВЫТЫ АКІЯН
ПАЎНОЧНЫ ЛЯДОВЫТЫ
ПАЎНОЧНЫ ЛЯДОВЫТЫ ПАЛЯРНЫ ЛЯДОВЫТЫ
Бічы-Пойнт
Анкарыдж
Кадыяк
Нор
Ветэя
Баранцбург
Мадзэйра (Партуг.)
Мадзэйра (Карэя)
Нумівак
Сэ Лоўрэнцэн (ЗША)
Сэ Мацеела (ЗША)
Алеуцкія а-вы (ЗША)
Берынгава м.
Берынгаў праліў
Ян-Маен (Данія)
Шпіцберген (Нарв.)
Берлінга а-ў
Ньюфаўндленд
Ньюфаўндленскі а-ў
Ньюфаўндленскі б-к
Ньюфаўндленскае м.
Ньюфаўндленскае п-ў
Ньюфаўндленскае п-ў
Ньюфаўндленскае п-ў

Чукоцкае нагор'і. Зах. адгалінаванні паўн. ч. гэтага пояса — хрыбты Верхаянскі і Чэрскага. Уздоўж усх. ўзбярэжжа паласа гор мерыдыянальнага напрамку: Каракскае нагор'е, Сярэдзінны хр. Камчаткі, Сіхатэ-Алінь, Маньчжура-Карэйскія і Анамскія горы. Вял. нагор'і А. Тыбецкае, Памір, Пярэдneазіяцкія (Малаазіяцкае, Армянскае, Іранскае), пласкагор'і Сярэднесібірскае, Аравійскага п-ва, Дэкан. Нізінныя раўніны Зах.-Сібірская, Туранская, Паўн.-Сібірская, Вял. Кітайская раўніна, Месапатамская, Інда-Гангская; высокія (у Цэнтр. А.) — Кашгарская, Джунгарская. На Камчатцы, а-вах Усх. А. і Малайскага архіпелага шмат дзеючых вулканаў.

**Геалагічная будова**. У тэктанічных адносінах А. складаецца з шэрагу стараж. платформаў (Сібірскай, Індыйскай, Кітайска-Карэйскай і Афрыкана-Аравійскай) і больш маладых складкавых структур. У абласцях іх распасцірання дакембрыйскія крышт. пароды выступаюць на паверхню ці перакрыты асадкавымі тоўшчамі. Уздоўж краёў Сібірскай платформы невял. тэр. займаюць структуры байкальскага ўзросту (Усх. Саян, Енісейскі краж, Прыбайкалле і Забайкалле). Да структур каледонскай складкавасці адносяцца паўн. дугі Цянь-Шаня, цэнтр. ч. Казахскага драбнасопачніка, паўн.-ўсх. раёны Кітая. Герцынская складкавасць ахапіла вял. тэр. А., у выніку ўтварыліся Урал, паўн. ч. Алтая, Салаір, Цянь-Шань, Куньлунь, Наньшань. Мезазойскія структуры пашыраны ў Паўн.-Усх. Сібіры, Забайкаллі, Індакітаі. Маладыя кайназойскія геал. структуры альпійскай складкавасці фарміраваліся ў Альпійскім і Ціхаакіянскім складкавых паясах, у выніку ўзніклі асн. рысы размяшчэння горных сістэм. Склалася шыротная горная сістэма, што працягнулася праз усю А. (Каўказ, Памір, Гімалаі і інш.). Каля падножжа маладых гор сфарміраваліся Месапатамскі, Інда-Гангскі і інш. вялізныя краявыя (перадгорныя) прагіны. **Карысныя выкапні**. У А. больш як палавіна сусветных запасаў нафты. Асн. нафтагазаносныя раёны: у краінах Персідскага заліва (Саудаўская Аравія, Аман, Кувейт, Катар, Іран), у Расіі (Зах. Сібір, Сахалін), а таксама ў Азербайджане, Казахстане, на а-вах Малайскага архіпелага (Суматра, Калімантан) і ў Кітаі. Найб. радовішчы каменнага вугалю ў Расіі (Кузнецкі, Канска-Ачынскі, Ленскі, Паўд. Якуцкі бас.), у Казахстане (Карагандзінскі бас.), Кітаі, Індыі, Карэі. Значныя паклады жал. руды ў Расіі (Прыангар'е, Паўд. Сібір), Казахстане (Кустанайская вобл., Цэнтр. Казахстан), Кітаі, Карэі, Індыі. Буйн. радовішчы марганцу ў Індыі і Грузіі; волава ў Паўд.-Усх. Азіі (М'янма, Тайланд, а-вы Інданезіі); медзі ў Казахстане (Джэзказган); нікелю ў Расіі (раён г. Нарыльска); графіту ў Расіі (Усх. Сібір) і Шры-Ланцы; слюды ў Расіі (Усх. Сібір) і Індыі; фасфарытаў у Казахстане і Кітаі; баксітаў — у Казахстане, Расіі (Паўд. Сібір), паўн.-ўсх. Кітаі, Індыі; золата ў Расіі, Узбекістане, Казахстане; алмазаў у Расіі [Саха (Якуція)]. Буйныя радовішчы кухоннай солі ў Расіі, Казахстане, Туркменістане, Турцыі, Іране, Пакістане.



Да арт. Азія. Каменная пустыня.

**Клімат**. А. размешчана ва ўсіх кліматычных паясах — ад арктычнага да экватарыяльнага. На б.ч. А. пераважае кантынентальны клімат. Зімой над А. фарміруецца ўстойлівая вобласць высокага ціску — *Азіяцкі антыцыклон*. Летам пануюць кантынентальныя трапічныя і ўмераныя паветраныя масы. На У і Пд А. развіта мусонная цыркуляцыя (гл. *Мусоны*). Сярэдняя т-ра студз. ад -20 °С на Пн да 25 °С каля экватара. Найб. нізкія зімовыя т-ры ў раёнах Аймякона і Верхаянска (да -70 °С, полюс холаду Паўн. паўшар'я). У ліпені на Пн т-ра ніжэй за 10 °С, у Цэнтр. А. 30 °С і больш. Макс. колькасць ападкаў на наветраных схілах гор Паўд. і Усх. А. (напр., у Чэрапунджы, у Індыі, да 12 000 мм за год); у экватарыяльных раёнах — больш за 2000 мм, у субтрапічных і ўмераных мусонных паясах —

Да арт. Азія. Лістоўнічная тайга ў Заходняй Сібіры (злева); джунглі Малайзіі.

600—2000 мм; ва ўнутр. кантынентальных раёнах — менш за 350 мм; у пустынях Аравійскага п-ва і Цэнтр. А. — менш як 150 мм за год. Клімат А. пустынна-арктычны і субарктычны на Пн; ва ўмераным поясе — рэзка кантынентальны, сухі (Усх. Сібір), умерана кантынентальны (Зах. Сібір); пустынны ў Сярэдняй А., Казахстане і паўн. ч. Цэнтр. А.; умераны мусонны на У; міжземнаморскі ў субтрапічным поясе (зах. ўскраіна М.Азіі); субтрапічны горна-стэпавы і пустынны на б.ч. М.Азіі; вільготны субтрапічны на У Закаўказзя (Калхідская ніз.); высакагорны пустынны на Паміры, Каракаруме, Тыбеце і інш.; субтрапічны мусонны на ўсх. ускраінах А.; трапічны пустынны клімат ва ўнутр. раёнах Зах., Сярэдняй А., Зах. Пакістана; субэкватарыяльны ў Індастане, Індакітаі, усх. раёнах в-ва Ява, экватарыяльны на Зондскіх а-вах і п-ве Малака.

**Унутраныя воды.** А. — краіна вялікіх рэк, займае першае месца ў свеце па сумарным аб'ёме сцёку. Водныя рэсурсы размешчаны нераўнамерна. У Паўн. Ледавіты ак. цякуць Об з Іртышом, Енісей з Ангарой і Ніжняй Тунгускай, Лена з Алданам і Вілюем, Яна, Індыгірка, Калыма; у Ціхі ак. — Анадыр, Амур з Сунгары, Усуры і Аргунню, Хуанхэ, Янцзы (самая доўгая і мнагаводная ў А., 5800 км), Сінзян, Меконг і Менам; у Індыйскі ак. — Салуін, Іравадзі, Брахмапутра, Ганг і Інд, а таксама Шат-эль-Араб (утвораны зліццём Тыгра і Еўфрата). Да рэк абласцей унутр. сцёку належаць Амудар'я, Сырдар'я, Чу, Ілі, Кура і інш. Ва ўмераных шыротах рэкі замярзаюць зімой і разліваюцца вясной. Рэкам мусоннай ч. А. характэрны летні макс. сцёк, міжземнаморскіх раёнаў — зімовы; рэкі экватарыяльных раёнаў паўнаводныя круглы год. Выкарыстоўваюцца як трансп. артэрыі і для ірыгацыі, маюць значныя энергарэсурсы. Буйныя азёры — Каспійскае і Аральскае моры — з'яўляюцца рэшткамі вял. мораў, у тэктанічных упадзінах ляжаць воз. Байкал (самае глыбокае, 1629 м), Ісык-Куль, Хубсугул, Урмія, Цялецкае; некаторыя азёры ўзніклі ў выніку абвалаў (Сарэзскае), карставых працэсаў (воз. Зах. Таўр). У бяссцёкавых упадзінах шмат салёных азёраў (Кукунор, Туз і інш.). На в-ве Паўн. Зямля, у гарах Памір, Гімалаі, Каракарум, Гіндукуш і інш. ёсць ледавікі. Агульная іх пл. 118,4 тыс. км$^2$. Значную тэр. Паўн., Зах. і Усх. Сібіры (каля 11 тыс. км$^2$) займае шматгадовая мерзлата.

**Глебы і расліннасць.** На раўнінах паўн. і сярэдняй ч. А. ярка выяўлена шыротная занальнасць. На Пн уздоўж узбярэжжа Паўн. Ледавітага ак. распасціраюцца арктычныя пустыні, тундра і лесатундра са слаба развітымі тундрава-глеевымі глебамі, на якіх растуць імхі, лішайнікі, ягаднікі, нізкарослыя дрэвы. Далей на Пд тундра і лесатундра змяняюцца вял. паласой зоны тайгі (цемнахвойнай на З — елка, сасна і светлахвойнай на У — піхта, лістоўніца, кедр) з пераважна падзолістымі мярзлотна-таежнымі глебамі. Тайга змяняецца лісцевымі (бярозавымі) лясамі, потым лесастэпам і стэпам з чарназёмнымі і каштанавымі глебамі, а на Д. Усходзе — шыракалістымі лясамі з дубу, клёну, грабу, ліпы. Паўпустыні і пустыні з шэраземнымі глебамі пашыраны на Аравійскім пв-е, у раёнах Іранскага нагор'я, Сярэдняй і Цэнтр. А. (Каракумы, Кызылкум, Гобі, Такла-Макан), дзе характэрна пустынна-стэпавая расліннасць: злакі, палын, саланчакі. У субтропіках Зах. А. міжземнаморская ксерафітная расліннасць на карычневых глебах, ва Усх. А. — мусонныя мяшаныя і шыракалістыя лясы на жаўтазёмах і чырваназёмах. У тропіках Усх. і Паўн. А. мусонныя лістападныя лясы і саванны на чырвона-жоўтых фералітных глебах; на наветраных схілах гор зялёныя лясы. На п-ве Індастан своеасаблівыя чорныя глебы сухіх саваннаў — рэгуры. У экватарыяльных шыротах (Інданезія) мнагаярусныя забалочаныя лясы (гілеі). У гарах вышынная пояснасць: у Паўн. А. пераважаюць чорная тайга і тундра, у Сярэдняй і Цэнтр. А. — горныя стэп і пустыні, у Паўд. А. — горныя трапічныя лясы. А. — радзіма большасці культ. раслін.

Да арт. Азія. Даліна Гейзераў на Камчатцы.

**Жывёльны свет** вельмі разнастайны і падпарадкаваны шыротнай занальнасці і вышыннай пояснасці. Некаторыя жывёлы маюць вял. арэалы (у ваўка і ліса амаль уся А.). Самы бедны жывёльны свет на паўн. акіянскіх узбярэжжах і ў тундры (лемінгі, пясцы; з птушак — белая сава, белая курапатка, гусі, гагі); на ўзбярэжжах і ў лядовых прасторах — белы мядзведзь; у морах — морж, цюлень, розныя віды рыб. У лясной зоне водяцца лось, алені (паўн. алень; на Пд марал і ізюбр), казуля, кабарга, расамаха, буры мядзведзь, рысь, собаль, куніца, гарнастай, вавёрка. Для фауны стэпаў, пустынь і горных пустынь характэрны антылопы (сайгак, джэйран), дзікія бараны і казуля; з драпежнікаў — барс, гепард, паласатая гіена, шакал. Захаваліся кулан, конь Пржэвальскага, дзікі двухгорбы вярблюд, шмат грызуноў (тушканчыкі, суслікі), надзвычай шматлікія паўзуны: яшчаркі (агамы, геконы, вараны), змеі (гюрза, кобра); некалькі відаў чарапах. Небяспечныя павукападобныя: скарпіёны, каракурт, тарантул, фалангі. У Цэнтр. А. водзяцца дзікі як, чырвоны воўк, снежны барс; у шыракалістых лясах — плямісты алень, янотападобны сабака, харза, чорны мядзведзь, бамбукавы мядзведзь. На Пд некалькі відаў малпаў: макакі, гібоны, у Інданезіі — арангутангі. У саваннах і экватарыяльных лясах жывуць слон, насарог, дзікі бык (буйвал), тапір, антылопы і інш. Для вывучэння і аховы прыроды ў многіх краінах створаны запаведнікі.

Да арт. Азія. Вільготныя субтропікі Закаўказзя.

**Насельніцтва.** У А. жыве каля 3,4 млрд. чал. (1994). 80% насельніцтва А. сканцэнтравана ў Кітаі, Індыі, Інданезіі, Пакістане і Японіі, дзе шчыльнасць насельніцтва дасягае 200—300

(часам 1500) чал. на 1 км$^2$, найб. нізкая шчыльнасць у Сібіры, Цэнтр. і Зах. А. (у асобных раёнах няма пастаяннага насельніцтва). У А. жывуць прадстаўнікі 3 асн. расаў: мангалоіднай (Усх., Паўд.-Усх., Цэнтр. і часткова Паўд. А., карэнныя жыхары Сібіры і Д.Усходу), еўрапеоіднай (Усх., Пач.-Усх., Цэнтр. і часткова Паўн. А., карэнныя жыхары Сібіры і Д. Усходу) і акіянскай галіны экватарыяльнай расы (Паўд.-Усх. і Паўд. А.). Ёсць пераходныя антрапалагічныя тыпы: пярэднеазіяцкі, пантыйскі, інда-афганскі і інш. Большасць насельніцтва А. вызнае ісламу (народы Пярэдняй Азіі, малайцы, яванцы і інш. народы Паўд.-Усх. А.) і будызм (манголы, карэйцы, кітайцы, японцы, в'етнамцы і інш.); распаўсюджана таксама хрысціянства (рускія, армяне, грузіны, філіпінцы, ч. арабаў Лівана і в'етнамцаў, альфуры), індуізм (насельніцтва Паўд. А.), даасізм і канфуцыянства (у Кітаі), сінтаізм (у Японіі), часткова джайнізм і сікхізм (у Індыі), іудаізм (у Ізраілі). У карэйцаў, в'етнамцаў і інш. захаваліся і анімістычныя вераванні.

**Палітычны падзел.** У межах А. і на прылеглых а-вах размешчаны дзяржавы: Аб'яднаныя Арабскія Эміраты, Азербайджан, Аман, Арменія, Афганістан, Бангладэш, Бахрэйн, Бруней, Бутан, В'етнам, Грузія, ч. Егіпта, Ізраіль, Іарданія, Індыя, Інданезія, Ірак, Іран, Емен, Казахстан, Камбоджа, Карэйская Народна-Дэмакратычная Рэспубліка, Катар, Кіпр, Кітай, Кувейт, Кыргызстан, Лаос, Ліван, Малайзія, Мальдывы, Манголія, М'янма, Непал, Пакістан, Палесціна (тэр. Зах. берага р. Іардан і сектар Газа), Расійская Федэрацыя, Рэспубліка Карэя, Саудаўская Аравія, Сінгапур, Сірыя, Таджыкістан, Тайланд, б.ч. Турцыі, Туркменістан, Філіпіны, Шры-Ланка, Японія, а таксама тэр. Аамынь (уладанне Партугаліі) і Сянган (Ганконг; уладанне Вялікабрытаніі).

*Літ.:* Власова Т.В. Физическая география материков. 3 изд. М., 1976; Физическая география материков и океанов. М., 1988; Народы мира: Ист.-этногр. справочник. М., 1988; Страны и народы: Зарубежная Азия: Общ. обзор; Юго-Западная Азия. М., 1979; Страны и народы: Советский Союз: Общ. обзор; Российская Федерация. М., 1983.

**А́ЗІЯ** (Asia), рымская правінцыя ў зах. частцы Малой Азіі. Утворана ў 133 да н.э. на тэр. б. *Пергамскага царства*. У 1 ст. да н.э. — 1 ст. н.э. яе тэр. была расшырана. Правінцыяльнае ўпарадкаванне з 126 да н.э. З 27 да н.э. — сенацкая правінцыя, з часоў Дыяклетыяна падзелена на 7 асобных правінцый.

**АЗІЯ́ЦКА-АМЕРЫКА́НСКАЯ РА́СА**, гл. *Мангалоідная раса*.

**АЗІЯ́ЦКА-ЦІХААКІЯ́НСКІ САВЕ́Т** (Asian and Pacific Council; АЗПАК), рэгіянальны паліт.-эканам. саюз краін Далёкага Усходу і зах. часткі Ціхага акіяна. Створаны ў 1966 Японіяй, Аўстраліяй, Новай Зеландыяй, Тайландам, Філіпінамі, Малайзіяй, Паўд. Карэяй, Тайванем і Паўд. В'етнамам з мэтай ваен. і гандлёва-эканам. супрацоўніцтва ў Азіяцка-Ціхаакіянскім рэгіёне. Пры АЗПАК дзейнічае рэгіянальны цэнтр па прадуктах харчавання і ўгнаеннях (Тайвань), культ. і сац. цэнтр (Паўд. Карэя). Вышэйшы орган паміж сесіямі савета — пастаянны к-т, выканаўчы орган — сакратарыят. Штаб-кватэра ў Бангкоку (Тайланд). У 1990 у АЗПАК уваходзілі Аўстралія, Новая Зеландыя, Паўд. Карэя, Тайланд, Філіпіны.

**АЗІЯ́ЦКАЯ ДЭПРЭ́СІЯ**, Паўднёваазіяцкая дэпрэсія, вобласць нізкага атм. ціску над Паўд., Зах. і часткова Цэнтр. Азіяй з цэнтрам над Іранскім нагор'ем. Адзін з сезонных кліматычных цэнтраў дзеяння атмасферы. Праяўляецца часцей летам. Абумоўлена моцным летнім праграванням мацерыка.

Да арт. **Азія.** Пясчаная пустыня ў Сярэдняй Азіі.

**АЗІЯ́ЦКАЯ САРАНЧА́** (Locusta migratoria migratoria), падвід насякомых атр. прамакрылых. Пашырана ў Паўд. Еўропе, Азіі і Паўн. Афрыцы.

Даўж. цела дарослых насякомых 3,5—6 см. Шэра-жаўтавата-зялёныя або зялёныя, надкрыллі ў бурых плямах. У залежнасці ад колькасці і канцэнтрацыі асобін утвараюцца стадная і адзіночная фазы. Лічынкі адзіночнай фазы зялёныя, жоўтыя, чорныя, стаднай — аранжавыя з чорнымі плямамі. Асобіны стаднай фазы ўтвараюць кулігі (шчыльная вял. колькасць лічынак) і чароды (вял. колькасць дарослых). Робіць пералёты на сотні кіламетраў. Вельмі шкодзіць с.-г. і дзікарослым раслінам. Кожны экз. за сваё жыццё з'ядае 300 г раслінай масы.

Да арт. **Азія.** Пік Кхумбутсе ў Гімалаях.

**АЗІЯ́ЦКІ АНТЫЦЫКЛО́Н**, Сібірскі антыцыклон, вобласць высокага атм. ціску ў Сібіры, Сярэдняй і Цэнтр. Азіі. Праяўляецца пераважна зімой (у студз. ціск да 1070 мб). А.а. — вынік моцнага ахаладжэння мацерыка, з чым звязана працяглая халодная (месцамі ніжэй за -50 °С) маласнежная зіма ва ўнутрымацерыковых раёнах. На надвор'е Беларусі ўплывае зах. адгалінаванне А.а.: устанаўліваецца малавоблачнае сонечнае надвор'е з т-рамі паветра ўдзень каля -10...-20 °С у зімовыя месяцы, вясной і восенню ноччу магчымыя замаразкі.



**Азіяцкая саранча:** 1 — дарослая; 2 — адзіночная фаза лічынкі; 3 — стадная фаза лічынкі.

**АЗІЯ́ЦКІ БАНК РАЗВІЦЦЯ́** (Asian Development Bank; АзБР), рэгіянальны міжнар. банк для фінансавання праграм развіцця. Створаны ў 1966. Члены больш як 40 краін Азіі, Еўропы, Акіяніі, у т.л. 14 развітых краін, якія не ўваходзяць у гэты рэгіён (ЗША, Вялікабрытанія, Германія, Канада і інш.). Штаб-кватэра ў Маніле (Філіпіны). Афіц. мэты: спрыяць развіццю эканомікі і знешняга гандлю краін Азіі, што сталі на шлях незалежнага развіцця; стымуляваць рэгіянальнае супрацоўніцтва, аказваць тэхн. дапамогу і дапамогу ў каардынацыі іх эканам. палітыкі. Вышэйшы орган — савет кіраўнікоў.

**АЗІЯ́ЦКІ КЛІ́РЫНГАВЫ САЮ́З**, пагадненне аб урэгуляванні дысбалансаў у міжнар. разліках паміж Бангладэш, Бірмай, Індыяй, Іранам, Непалам, Пакістанам і Шры-Ланкай. За адзінку разлікаў прынята азіяцкая грашовая адзінка, роўная па кошце адзінцы спец.

правоў запазычання (СДР) у *міжнародным валютным фондзе.*

**АЗІЯ́ЦКІЯ ГУ́ЛЬНІ**, буйныя комплексныя спарт. спаборніцтвы краін Азіі. Праводзяцца з 1951 раз у 4 гады (праз 2 гады пасля Алімпійскіх гульняў). Іх арганізацыю і правядзенне ажыццяўляе федэрацыя А.г. (засн. ў 1949), у якую ўваходзяць нац. алімп. к-ты азіяцкіх краін. У праграме А.г. абавязковыя віды спорту (лёгкая атлетыка, плаванне) і не менш як 8 інш. відаў, якія ўключаюцца Аргкамітэтам А.г. пры ўмове, што яны існуюць не менеі, як у 6 краінах, 4 з якіх — удзельнікі чарговых гульняў.

**АЗМІ́ЦЕЛЬ** Фёдар Фёдаравіч (13.8.1918, с. Лінавіцк Мартукскага р-на Акцюбінскай вобл., Казахстан — 15.6.1944), удзельнік партыз. руху ў Віцебскай і Мінскай абл. у Вял. Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Камандзір партыз. атрада асобага прызначэння (дзейнічаў у трохвугольніку Орша—Віцебск—Смаленск), партыз. атрада «Гром». У чэрв. 1944 у час варожай блакады партыз. брыгад каля воз. Палік камандаваў штурмавой групай па прарыве акружэння. Цяжка паранены, падарваў сябе гранатай.

**АЗНАБІ́ШЫН** Дзмітрый Пятровіч (1804, с. Троіцкае, Карсунскі р-н Ульянаўскай вобл. — 14.8.1877), рус. паэт. Скончыў Маскоўскі універсітэцкі пансіён (1824). У 1827 заснаваў (з С.Я.Раічам) альманах «Северная лира». Першыя арыгінальныя і перакладныя вершы і аповесці друкаваў у альманахах і час. «Вестник Европы», «Северные цветы», «Отечественные записки». Любоўную і пейзажную лірыку стварaў пад уплывам паэзіі Усходу: зб-кі «Селам, або Мова кветак» і «Гінекіён» (1830), «Сізіф і смерць» (1871). Перакладаў на рус. мову творы Хафіза, Нізамі, Саадзі, зах.-еўрап. паэтаў. Склаў першы персідска-рускі слоўнік, зб. матэрыялаў (у 2 тамах) па сялянскай рэформе 1861. Збіраў фальклор народаў Паволжа.

**АЗНАВУ́Р** (Aznavour) Шарль (сапр. Азнавуран Варэнаг; н. 22.5.1924, Парыж), французскі шансанье, кампазітар, кінаакцёр. З сям'і арм. эмігрантаў. Аўтар песень (з 1960-х г. іх аркеструе П.Марыа), аперэт, музыкі да кінафільмаў. Здымаўся ў кінафільмах «Д'ябал і дзесяць запаведзяў», «Страляйце ў піяніста» і інш. Аўтар кн. «Азнавур вачамі Азнавура» (1970). Яго творчасці прысвечаны франц. дакумент. фільм «Спявае Шарль Азнавур».

**АЗНАУ́РЫ**, грузінскія дваране. Вядомыя з 5 ст. Былі патомныя і служылыя, падзяляліся на царскіх, княжацкіх і царкоўных. Валодалі зямлёй, неслі абавязковую вайсковую павіннасць. З далучэннем Грузіі да Рас. імперыі (пач. 19 ст.) атрымалі правы рас. дваран.

**АЗНАЧЭ́ННЕ** ў граматыцы, даданы член сказа, які паясняе словы з прадметнымі значэннямі, называючы прыкмету прадмета (яго якасць, форму, памер, матэрыял, адносіны да інш. прадметаў і г.д.). У бел. мове А. падзяляюцца на дапасаваныя (сінтаксічная сувязь — дапасаванне, сродкі выражэння — прыметнік, дзеепрыметнік, займеннік, лічэбнік: «зялёная ялінка», «бацькава парада», «неадасланае пісьмо», «нашы сябры», «трэці год») і недапасаваныя (сінтаксічная сувязь — прымыканне, сродкі выражэння — назоўнік ва ўскосных склонах часам з прыназоўнікам, займеннік, інфінітыў, прыслоўе, а таксама словазлучэнні розных тыпаў: «дом восем», «дарога бацькоў», «дзяўчынка з бантам», «яе клопат», «імкненне вучыцца», «паварот налева», «стары высокага росту»). Асобная форма А. — *прыдатак. А.Я.Міхневіч.*

**АЗО́ВА-СІВА́ШСКАЯ ЗАПАВЕ́ДНА-ПАЛЯЎНІ́ЧАЯ ГАСПАДА́РКА**, на Пд Украіны, у Херсонскай вобл. Засн. ў 1957 на базе Азова-Сівашскага запаведніка (1927). Пл. 57,4 тыс. га. Складаецца з 2 ізаляваных участкаў: запаведнапаляўнічай гаспадаркі на касе Біручы Востраў у Азоўскім м. і запаведнай тэр. ў цэнтр. ч. Сівашскага заліва. Створана ў мэтах аховы прыродных комплексаў пясчанага і саланчаковага стэпаў і водна-балотных угоддзяў, а таксама для акліматызацыі і размнажэння еўрап. высакароднага аленя, лані, еўрап. муфлона і фазана. Нізінныя ч. касы і прылеглая акваторыя Утлюцкага лімана — улюбёныя мясціны качак, чапляў, кулікоў.

**АЗО́ЛЫ**, пяцічленныя *гетэрацыклічныя злучэнні*, якія маюць у цыкле атамы вугляроду і не менш як два гетэраатамы, адзін з іх азот. Да А. належаць аксазол, *імідазол, піразол,* тыязол і інш. Маюць араматычныя ўласцівасці. Уваходзяць у састаў прыродных злучэнняў і лекаў (вітаміны $B_1$ і $B_{12}$, амідапірын, анальгін, гістыдзін і інш.).

**АЗО́Н**, $O_3$, алатропная мадыфікацыя *кісларoду.* Газ сіняга колеру, з рэзкім пахам, $t_{кіп}$ -112 °С, моцны акісляльнік, у вял. канцэнтрацыях раскладаецца з выбухам, утварае *азаніды.* Асн. колькасць А. ў прыродзе знаходзіцца ў *азанасферы* Зямлі. Атрымліваюць дзеяннем эл. разраду ці УФ-выпрамянення на паветра. Выкарыстоўваюць для дэзінфекцыі вады, паветра, адбельвання тканін, мінер. масла, як бактэрыцыдны сродак. Лішак А. шкодны для жывых арганізмаў, ГДК у паветры 1 мг/м$^3$.

**АЗО́НЧЫК** Аляксандр Сямёнавіч (н. 10.8.1908, в. Яцкавічы Мядзельскага р-на Мінскай вобл.), адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Мядзельскім р-не ў Вял. Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). З 1922 працаваў на сельскай гаспадарцы, з 1939 у органах НКУС. У жн. 1941 арганізаваў партыз. дыверсійную групу, якая дзейнічала ў складзе атрада імя Будзённага, са снеж. 1943 камандзір атрада «Патрыёт» і нач. асобага аддзела брыгады імя Будзённага. У 1944—57 на сав. рабоце.

**АЗО́РСКІ АНТЫЦЫКЛО́Н**, Азорскі максімум, субтрапічная вобласць высокага атм. ціску над Атлантычным ак. з цэнтрам каля Азорскіх а-воў. Праяўляецца пераважай антыцыкланічнай дзейнасці на працяту ўсяго года, асабліва добра выражаны летам (у ліп. ціск больш за 1025 Па). Прыкметна ўплывае на клімат Паўд. Еўропы і Паўн. Афрыкі , утварае летам адгалінаванне ў напрамку Міжземнага м., зімой у напрамку Сахары. На надвор'е Беларусі ўплываюць паўн.-ўсх. перыферыя або адасобленыя «ядры» А.а.: устанаўліваецца сухое і сонечнае надвор'е з высокімі т-рамі паветра (зімой часам да 8 °С і больш, летам да 25—30 °С і вышэй).

**АЗО́РСКІЯ АСТРАВЫ́** (партуг. Ilhas dos Açores Астравы ястрабаў), архіпелаг у Атлантычным ак., на З ад Пірэнейскага п-ва. Пл. 2,3 тыс. км$^2$. Працягваецца з З на У прыблізна на 600 км. Складаецца з 9 буйных а-воў (Сан-Мігел, Тэрсейра, Піку, Сан-Жоржы, Флорыш і інш.) і некалькіх рыфаў. Уваходзіць у склад Партугаліі. Нас. 243,4 тыс. чал. (1981). Астравы вулканічнага паходжання, маюць горны рэльеф з вяршынямі да 2351 м (г. Піку на в-ве Піку), стромкія берагі. Разнастайныя праяўленні сучаснага вулканізму (фумаролы, мінер. і тэрмальныя крыніцы). Частыя землетрасенні. Клімат субтрапічны, акіянскі. Сярэдняя т-ра студз. каля 14 °С, ліп. каля 22 °С. Ападкаў 700—800 мм за год. На схілах субтрапічныя горныя лясы і кусты. Плантацыі бананаў, цытрусавыя, вінаградарства. Цэнтр марскіх і паветраных трансатлантычных ліній паміж Еўропай, Афрыкай і Амерыкай. Найб. гарады і парты: Понта-Дэлгада, Анграду-Эраіжму, Орта.

**АЗО́Т** (лац. Nitrogenium), N, хім. элемент V групы перыяд. сістэмы, ат. н. 7, ат. м. 14,0067. Прыродны А. складаецца з ізатопаў $^{14}N$ (99,635%) і $^{15}N$ (0,365%); ёсць у свабодным стане ($N_2$) у атмасферы (75,6%), у звязаным у літасферы ($1{,}9\cdot10^{-3}$% па масе), у жывых арганізмах жывёл і чалавека (складае 16—17% іх бялку) і раслінах. А. чацвёрты па распаўсюджанасці элемент Сонечнай сістэмы (пасля вадароду, гелію, кісларoду). Адкрыты ў 1772 Д.*Рэзерфардам.* Газ без колеру і паху, $t_{кіп}$ -195,80 °С, шчыльн. вадкага А. $0{,}808\cdot10^3$ кг/м$^3$. Малекула двухатамная, пры звычайных умовах хімічна інертная, пры т-ры 400—500 °С узаемадзейнічае са шчолачнымі і шчолачна-зямельнымі металамі, у прысутнасці каталізатараў — з кіслародам (гл. *Азоту аксіды*), пры павышаным ціску — з вадародам (гл. *Аміяк, Гідразін* і інш.). Пры эл. разрадах, раскладанні нітрыдаў некаторых металаў утвараецца актыўны А. (сумесь малекул і атамаў), які энергічна ўзаемадзейнічае з кісларо-

дам, вадародам, парай серы і фосфару, некат. металамі. Атрымліваюць пры рэктыфікацыі паветра (гл. *Газаў раздзяленне*). Выкарыстоўваецца для сінтэзу аміяку, як інертнае асяроддзе пры хім. і металург. працэсах, пры перапампоўванні гаручых вадкасцяў, у розных халадзільных і вакуумных установках, зварцы металаў. А. — біягенны элемент, уваходзіць у састаў *бялкоў* і *нуклеінавых кіслот*, а таксама многіх арган. злучэнняў (*аміны, амінакіслоты, нітразлучэнні* і інш.).

**АЗОТАБА́КТЭР** (Azotobacter), род аэробных *азотфіксавальных бактэрый*. Жывуць свабодна ў глебе, водным асяроддзі. Упершыню апісаны галанд. вучоным М.Беерынкам (1901). Форма А. палачкападобная або сферычная, памер 2×5 мкм; грамадмоўныя, могуць пераміцца з дапамогай жгуцікаў; з узростам ператвараюцца ў нерухомыя, укрытыя слізістай капсулай сферычныя клеткі (цысты), больш устойлівыя да неспрыяльных умоў асяроддзя. На працяг росту звязваюць да 20 г малекулярнага азоту на 1 г выкарыстанага вугляводу. Найбольш пашыраны на акультураных глебах А. chroococcum выкарыстоўваецца для атрымання *азотабактэрыну*. Прадуцыруюць поліцукрыды, шэраг вітамінаў, антыбіетыкі.

**АЗОТАБАКТЭРЫ́Н**, азотаген, бактэрыяльны прэпарат для абагачэння глебы звязаным азотам. Вырабляецца на аснове аднаго з відаў *азотабактэру*. Выкарыстоўваюць пад агароднінныя і прапашныя культуры. Уносяць у глебу з насеннем або апрацоўваюць ім клубні, карані расады с.-г. культур, якія не належаць да сям. бабовых. На глебах Беларусі з высокай кіслотнасцю і малой урадлівасцю малаэфектыўны.

**АЗОТНАКІ́СЛЫЯ СО́ЛІ**, тое, што *нітраты*.

**АЗО́ТНАЯ КІСЛАТА́**, аднаасноўная моцная кіслата, $HNO_3$, мал. м. 63,016. Бясколерная вадкасць, $t_{кіп}$ 82,6 °С (з раскладаннем), шчыльн. $1{,}522 \cdot 10^3$ кг/м$^3$, з вадой утварае *азеатропную сумесь* (68,4% А.к.), утварае крышталегідраты; моцны акісляльнік. Атрымліваюць каталітычным акісленнем аміяку кіслародам паветра. Выкарыстоўваюць у вытв-сці азотных і комплексных угнаенняў, выбуховых рэчываў, фарбавальнікаў, у металургіі (траўленне і растварэнне металаў) і інш. Выклікае апёкі на скуры, пара ядавітая.

**АЗО́ТНЫЯ ЎГНАЕ́ННІ**, мінеральныя і арган. рэчывы, якія выкарыстоўваюцца для забеспячэння раслін азотам. Падзяляюцца на *арганічныя ўгнаенні* (гной, торф, кампост), якія акрамя азоту маюць у сабе інш. элементы, *мінеральныя ўгнаенні* (выпускаюцца прам-сцю ў цвёрдым ці вадкім стане) і зялёныя ўгнаенні (гл. *Сідэрацыя*). У мінеральных азот можа быць у аміячнай ($NH_3$), аміячна-нітратнай ($NH_3$ і $NO_3$), нітратнай ($NO_3$) і аміднай ($NH_2$) формах. Асн. віды мінер. А.у.: аміячныя, аманійныя, нітратныя, аманійна-нітратныя, амідныя, аманійна-нітратна-амідныя.

Аміячныя і аманійныя ўгнаенні: вадкі аміяк, *аміячная вада*, сульфаты амонію, амонію-натрыю. Растваряюцца ў глебавай вадзе, значная частка іонаў амонію звязваецца ў маларухомую форму, якая пад уздзеяннем спецыфічных бактэрый глебы пераходзіць у больш рухомую нітратную форму і засвойваецца раслінамі. Выкарыстоўваюцца для ўсіх с.-г. культур на някіслых глебах і кіслых пры іх выпнаванні. Нітратныя ўгнаенні: натрыевая і кальцыевая *салетры*. Іоны натрыю і кальцыю пагланаюцца цвёрдай фазай глебы і раслінамі спажываюцца менш, чым нітратны азот, што прыводзіць да падшчалочвання глебы. Выкарыстоўваюцца на ўсіх глебах для ўнясення перад сяўбой і для ўсіх відаў раслін у перыяд вегетацыі. Аманійна-нітратныя ўгнаенні: аміячная салетра, сумесі сульфат-нітрат амонію, вапнава-аміячная салетра. Выкарыстоўваюцца ў розных кліматычных зонах для розных глебаў. Амідныя ўгнаенні бываюць хутка дзейныя (*карбамід*) і павольна дзейныя (урэаформ—карбаміда-фармальдэгідныя ўгнаенні). Аманійна-нітратна-амідныя ўгнаенні — канцэнтраваныя растворы карбаміду, нітрату амонію і іх растворы ў аміячнай вадзе (*аміякаты*). Эфектыўныя пры ўнясенні ў глебу для падкормкі раслін, аміякаты — для невегетуючых с.-г. культур. На Беларусі (Гродзенскі азотна-тукавы завод) вырабляюць аміячную салетру, карбамід, вадкія ўгнаенні і сульфат амонію.

*Літ.:* Агрохимия. М., 1982; Баранов П.А., Алейнов Д.П., Олевский В.М. Азотные растворы... // Химия в сельском хозяйстве. 1983. № 5.

**АЗО́ТУ АКСІ́ДЫ**, азоту вокіслы, злучэнні азоту з кіслародам. Адрозніваюць: геміяаксід $N_2O$ (аксід дыазоту) і монааксід NO — бясколерныя газы; сесквіяаксід $N_2O_3$ (дыазоту трыаксід) — пры звычайных умовах няўстойлівае злучэнне, пры ахаладжэнні светла-блакітная маса з $t_{пл.}$ -102 °С; дыаксід азоту $NO_2$ — буры газ (у вадкім і цвёрдым стане існуе яго дымер тэтрааксід дыазоту $N_2O_4$); аксід азоту $N_2O_5$ (пентаксід дыазоту) — бясколерныя лятучыя крышталі, няўстойлівыя і выбухованебяспечныя. Монааксід і дыаксід азоту парамагн. злучэнні. Аксід дыазоту і монааксід азоту — нясолеўтваральныя аксіды, сесквіяаксід утварае з вадой азоцістую кіслату, аксід азоту — азотную, тэтрааксід дыазоту — іх сумесь. Выкарыстоўваюцца пераважна $NO_2$ як акісляльнік у вадкім ракетным паліве, пры ачыстцы нафтапрадуктаў, каталітычным акісленні арган. злучэнняў і NO — паўпрадукт у вытв-сці азотнай кіслаты. А.а. фізіялагічна актыўныя рэчывы: $NO_2$ — «вяселячы газ» — выкарыстоўваецца для анестэзіі; NO дзейнічае на цэнтр. нерв. сістэму, у вял. канцэнтрацыях адмоўна ўплывае на формулу крыві (ГДК у паветры 0,0005 мг/л); $NO_2$ выклікае апёкі, зніжае крывяны ціск.

**АЗОТФІКСАВА́ЛЬНЫЯ БАКТЭ́РЫІ**, азотфіксатары, мікраарганізмы, здольныя засвойваць малекулярны азот атмасферы і пераводзіць яго ў складаныя азоцістыя злучэнні. Сімбіятычныя А.б. (найб. актыўныя фіксатары азоту) існуюць у сімбіёзе пераважна з бабовымі раслінамі (гл. *Актынаміцэты, Клубеньчыкавыя бактэрыі*), несімбіятычныя жывуць свабодна (*азотабактэр, кластрыдыі*, некаторыя віды цыянабактэрый, фотатрофных бактэрый, асобныя віды грыбоў і дражджэй). А.б. ўдзельнічаюць у кругазвароце азоту ў прыродзе, абагачаюць ім глебу і вадаёмы, пераводзяць яго ў форму, даступную для засваення вышэйшымі раслінамі.

**АЗОТФІКСА́ЦЫЯ** (ад *азот* + лац. fixatio замацаванне) біялагічная, звязванне малекулярнага азоту атмасферы ў азотзмяшчальныя злучэнні. Ажыццяўляецца *азотфіксавальнымі бактэрыямі* (найб. актыўныя клубеньчыкавыя). Першы стабільны прадукт у выніку А. — аміяк, сінтэз якога каталізуе *нітрагеназа*. Вызначаны структура і лакалізацыя генаў А. Адыгрывае важную ролю ў прыродным кругавароце азоту, абагачэнні глебы і вадаёмаў звязаным азотам. Азотфіксавальныя мікраарганізмы ў спалучэнні (сімбіёзе) з раслінамі, напр. лубінам, гарохам, вікай, могуць абагаціць 1 га глебы на 200—500 кг азоту за год.

**АЗО́Ў**, горад у Рас. Федэрацыі, у Растоўскай вобл. Порт на р. Дон, за 7 км ад упадзення ракі ў Таганрогскі заліў Азоўскага мора. Чыг. станцыя. 81 тыс. ж. (1992). Машынабудаўнічая (кавальска-прэсавае, гандл. абсталяванне, рыбалавецкія судны), лёгкая, харч. прамысловасць. Гіст.-краязнаўчы музей.

У 10—11 ст. А. у складзе *Тмутараканскага княства*. Каля 1067 захоплены полаўцамі (назвалі яго Азак). З 13 ст. горад у *Залатой Арды*, з 1471 тур. ваен. крэпасць. У 1637—42 А. валодалі данскія казакі. У 1696 узяты войскамі Пятра I, у 1711 вернуты Турцыі. З 1739 у Расіі. У 1775—82 цэнтр Азоўскай губ., пазней ваен. крэпасць. З 1810 пасад Растоўскага пав. Екацярынаслаўскай губ.

**АЗО́ЎСКАЕ МО́РА** (стараж.-рус. Суражское мора), унутранае мора Атлантычнага ак. на Пд Усх.-Еўрап. раўніны; самае мелкае на Зямлі. Пл. 39 тыс. км$^2$, аб'ём 0,29 тыс. км$^3$, сярэдняя глыб. 7 м, найб. — 15 м. Узбярэжжа належыць Украіне і Рас. Федэрацыі. Керчанскім пралівам злучана з Чорным м. Паўн. і паўд. берагі ўзгорыстыя і абрывістыя, зах. і ўсх. — пераважна нізінныя. Шмат пясчаных касаў (Бярдзянская, Арабацкая Стрэлка і інш.). Залівы Таганрогскі, Цемрукскі, Сіваш. Упадаюць Дон, Кубань, Міус, Кальміус і інш. Клімат пераважна кантынентальны. Укрыта лёдам 2—3 месяцы. Летам т-ра вады на паверхні да 25—30 °С. Цячэнні няўстойлівыя. У канцы 20 ст. выкарыстанне водных рэсурсаў рэк у бас. А.м. садзейнічае памяншэнню аб'ёму і змене рэжыму паступлення ў мора рачнога сцёку, павелічэнню прытоку больш салёнай вады з Чорнага мора,

што ўплывае на склад флоры і фауны мора. Салёнасць 10—13%, у малаводныя гады да 15—17%; памяншаецца ўлоў рыбы (судак, лешч, таран, сяўруга, хамса, цюлька і інш.). Транспартнае значэнне павялічылася пасля буд-ва Волга-Данскога канала. Порты: Марыупаль, Таганрог, Ейск, Бярдзянск, у вусці Дона — Растоў. Шмат курортаў і зон адпачынку.

**«АЗОЎСТА́ЛЬ»**, гл. *Марыупальскі металургічны камбінат «Азоўсталь»*.

**АЗОЦІСТАКІ́СЛЫЯ СО́ЛІ**, гл. *Нітраты*.

**АЗО́ЦІСТАЯ КІСЛАТА́**, аднаасноўная слабая няўстойлівая кіслата, $HNO_2$. Існуе толькі ў разбаўленых водных растворах, яе солі і эфіры наз. *нітрытамі*. Утвараецца разам з *азотнай кіслатой* пры растварэнні $NO_2$ у вадзе. Выкарыстоўваецца ў вытв-сці фарбавальнікаў.

Марскі газавы промысел на Азоўскім моры.

**АЗО́ЦІСТАЯ РАЎНАВА́ГА**, стан азоцістага абмену арганізма, што вызначаецца роўнай колькасцю вылучанага і спажытага азоту. Бывае адмоўная (азоту вылучаецца больш, чым спажываецца) і дадатная (у процілеглым выпадку). Адмоўная А.р. ўсталёўваецца ў арганізме пры галаданні, нізкай колькасці бялку ў ежы, значных траўмах і звязана з разбурэннем бялку. Дадатная А.р. характэрная для маладога арганізма і мае месца пры рэгенерацыі тканак, у перыяд выздараўлення пасля цяжкай хваробы. Чалавеку патрабуецца каля 16 г бялковага азоту ў суткі, што адпавядае 100 г бялку пры энергазатратах 10,5 МДж (2500 ккал).

**АЗПАК**, гл. *Азіяцка-ціхаакіянскі савет*.

**АЗУЛЕ́НЫ**, арганічныя злучэнні, малекулы якіх маюць 7-членны цыкл, спалучаны з 5-членным. Належаць да небензоідных *араматычных злучэнняў*, біпалярныя ў выніку асіметрыі кольцаў. Найпрасцейшы прадстаўнік — азулен, $C_{10}H_8$, мал. м. 128, $t_{пл}$ 99 °С. А. маюць сіні ці фіялетавы колер, растваральна ў мінер. к-тах, акісляюцца ў паветры, ізамерызуюцца ў нафталіны, утвараюць комплексы.

Азурыт.

Штучна атрымліваюць цыклізацыяй 10-членных цыклічных злучэнняў ці ўзаемадзеяннем пірыдзіну з цыклапентадыенам. Ёсць у эфірных алеях рамонку, палыну і інш. раслін.

**АЗУРЫ́Т** (ад франц. azur лазур, блакіт), мінерал з класа карбанатаў, $Cu_3[(OH)CO_3]_2$. Крышталізуецца ў манакліннай сінганіі. Мае 53,3% медзі. Утварае шчоткі і друзы пераважна дробных крышталёў, агрэгаты, канкрэцыі, шчыльныя масы, зямлістыя скопішчы. Колер цёмна-сіні, васільковы, блакітны. Бляск шкляны. Празрысты да паўпразрыстага. Цв. 3,5—4. Шчыльн. 3,8 г/см$^3$. Тыповы мінерал зон акіслення меднарудных жылаў. Пры далейшым акісленні ператвараецца ў *малахіт*. Другасная руда медзі. Выкарыстоўваецца ў вытв-сці сіняй фарбы.

Азхар.

**А́ЗХАР** (аль-Азхар, аль-Джамі аль-Азхар), комплекс мусульм. рэліг. і свецкіх вышэйшых навуч. і н.-д. устаноў у Каіры. Засн. ў 10 ст. пры мячэці аль-Азхар. Уключае: Вышэйшы вучоны савет А.; Акадэмію ісламазнаўства; ун-т аль-Азхар з ф-тамі мусульм. права, багаслоўскім, арабскай мовы, інж., с.-г., мед., адм. і мусульм. жан. каледжам; ін-ты і спец. рэліг. ўстановы ў Каіры і цэнтрах правінцый.

**АЗЫ́Х**, стаянка першабытнага чалавека ў пячоры каля в. Азых (Нагорны Карабах, даліна р. Куручай). У напластаваннях таўшч. каля 14 м выяўлены матэрыялы ад ранняга *ашэля* да *мусцье*, у т.л. фрагмент сківіцы самага стараж. на Каўказе выкапнёвага чалавека — азыхантрапа (сярэдні ашэль). На думку некат. даследчыкаў, знаходкі аббітых галек у ніжніх пластах стаянкі даюць падставу меркаваць пра з'яўленне тут чалавека ў эпоху *олдувай*.

**АЗЯМБЛО́ЎСКІ** Юзаф (каля 1804, Мінск — 27.8.1878), мастак-графік. У пач. 1830-х г. вучыўся ў *Я.Рустэма*. У 1835 заснаваў у Вільні літаграфскую майстэрню, дзе ілюстравалі свае кнігі Ю.Крашэўскі, Т.Нарбут, Ф.Бохвіц, Ю.Струміла, Я.Шымлер і інш. Сярод твораў А. — пейзажы, віды Вільні, літ. і бел. гарадоў, жанравыя замалёўкі, партрэты Рустэма, Ю.Франка, вял. князёў ВКЛ Альгерда, Жыгімонта II Аўгуста і інш.; літаграфія «Славянскі нявольнік» («Беларускі раб», 1840-я г.), якую А. Міцкевіч выкарыстоўваў як ілюстрацыю ў лекцыях аб прыгонным праве ў Расіі.

*В.Ф.Шматаў.*

**АЗЯРА́НСКАЕ ВО́ЗЕРА**, у Беларусі, у Мастоўскім р-не Гродзенскай вобл., у басейне р. Сіпа (працякае праз возера). Пл. 0,49 км$^2$, даўж. 1 км, найб. шыр. 0,55 км, найб. глыб. 3,8 м. Пл. вадазбору каля 25 км$^2$. Берагі спадзістыя, уздоўж іх возера зарастае. Пойма забалочаная.

**АЗЯРА́НЫ**, вёска ў Беларусі, у Жыткавіцкім р-не Гомельскай вобл., на р. Сцвіга. Цэнтр сельсавета і калгаса «Савецкая Беларусь». За 29 км на Пд ад г. Жыткавічы, 300 км ад Гомеля. 608 ж., 250 двароў (1994). Дрэваапрацоўчы цэх Прыпяцкага запаведніка, Азяранскае лясніцтва. Сярэдняя і музычная школы, Дом культуры, б-ка, бальніца, дзіцячы сад, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў. Селішчы ранняга жал. веку і эпохі феадалізму.

**АЗЯРА́НЫ**, вёска ў Беларусі, у Рагачоўскім р-не Гомельскай вобл., на р. Друць. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Крупскай. За 36 км на ПнЗ ад Рагачова, 155 км ад Гомеля. 689 ж., 289 двароў

(1994). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, аддз. сувязі, камбінат быт. абслугоўвання. Брацкая магіла сав. воінаў. Каля А. стараж. гарадзішча (8—7 ст. да н.э. — 1—2 ст. н.э.) і курганны могільнік *дрыгавічоў* (11—12 ст.).

**АЗЯРА́ЎСКАЕ КАМСАМО́ЛЬСКА-МАЛАДЗЁЖНАЕ ПАДПО́ЛЛЕ** ў Вялікую Айчынную вайну. Дзейнічала з ліп. 1942 да ліп. 1944 у в. Азяраўцы і суседніх вёсках Браслаўскага р-на Віцебскай вобл. Аб'ядноўвала 26 чал., падтрымлівала сувязь з партыз. брыгадай імя Жукава, вяло развед. работу ў ням. гарнізонах Даўгаўпілса, Вільнюса, праводзіла дыверсіі.

**АЗЯРКО́**, возера ў Беларусі, у Лепельскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Ула, за 12 км на ПнУ ад Лепеля. Пл. 0,26 км$^2$, даўж. 0,95 км, найб. шыр. 0,45 км. Пл. вадазбору 3 км$^2$. Схілы катлавіны пласкахвалістыя, выш. да 10 м, разараныя. Зарастае слаба.

**АЗЯРНІ́ЦА**, вёска ў Беларусі, у Слонімскім р-не Гродзенскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Прагрэс». За 34 км на З ад Слоніма, 180 км ад Гродна, 2 км ад чыг. ст. Азярніца. 442 ж., 173 двары (1994). Сярэдняя школа, б-ка, клуб, бальніца. Царква.

Упершыню ўпамінаецца ў 1478 сярод «прысёлкаў» маёнтка Дзярэчын, якім валодалі Копачы. У 15—16 ст. належала Б. Мілашэвічу, Б.Багавіцінавічу, І.Гарнастаю. У 1886 — 418 ж., 39 двароў, школа, царква, сінагога, штогод праводзіліся 2 кірмашы. З 1940 цэнтр сельсавета.

**АЗЯРНО́Е**, паселішчы неаліту і бронзавага веку каля в. Азярное Любанскага р-на Мінскай вобл., на беразе воз. Вячэра. На паселішчы-1 знойдзены крамянёвыя прылады (нажы, скоблі, скрабкі, наканечнікі стрэл і інш.), кераміка *днепра-данецкай культуры* (канец 3 — пач. 2-га тыс. да н.э.), *сярэднядняпроўскай культуры* (2-я чвэрць 2-га тыс. да н.э.) і інш. На паселішчы-2 акрамя вырабаў з крэменю і керамікі са дна возера паднята больш за 70 прылад з косці і рогу (кінжалы, наканечнікі коп'яў, дроцікаў і стрэл, гарпуна, матыкі і інш.). На адной з іх выгравіраваны 2 выявы чалавека і ромбападобная фігура.

**АЗЯРО́Д**, 1) гаспадарчая пабудова на Беларусі; збудаванне са слупоў і жэрдак для дасушвання збажыны, сена, бульбоўніку і інш. Лакальныя назвы пераплот, астраўкі. Найб. пашыраны ў цэнтр. і паўн. раёнах. У фальварках А. размяшчалі непасрэдна каля гумнаў, стадол, такоў. Цяпер у меншай ступені бытуе ўсюды. 2) Бел. нар. гульня. Удзельнікі бяруць дугу за адзін канец, а другім стукаюць аб зямлю так, каб дуга, саспружыніўшы, пераляцела цераз А. (адсюль назва). Пераможца той, у каго дуга пераляціць цераз А. больш разоў.

**АЗЯРО́К**, Азяркі, возера ў Беларусі, у Гарадоцкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Аўсянка. Пл. 0,28 км$^2$, найб. глыб. 8 м. Пл. вадазбору каля 4 км$^2$. Схілы выш. 8—10 м, парослыя хмызняком, у верхняй частцы разараныя. Берагі пясчаныя і затарфаваныя. Дно плоскае, пясчанае, глыбей за 2,5 м глеістае. Сцёк у р. Аўсянка. Расліннасць уздоўж берагоў, у яе складзе вадзяны арэх плывучы — рэлікт даледавіковай флоры (ахоўны від на Беларусі).

**АЗЯРЦЫ́**, вёска ў Беларусі, у Глыбоцкім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр сельсавета і племсаўгаса «Азярцы». За 7 км на ПнУ ад Глыбокага, 215 км ад Віцебска, 10 км ад чыг. ст. Глыбокае. 786 ж., 306 двароў (1995). Спірт- і вінзаводы. Сярэдняя школа, б-ка, Дом культуры, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі.

**АЗЯРЫ́ЧЫНА**, вёска ў Беларусі, у Вузлянскім с/с Пухавіцкага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса «Перамога». За 35 км на З ад Мар'інай Горкі, 50 км ад Мінска, 13 км ад чыг. ст. Рудзенск. 318 ж., 131 двор (1995). Сярэдняя школа, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі.



Ю.Азямблоўскі. Славянскі нявольнік (Беларускі раб). Літаграфія 1840-я г.

**АЗЯРЫ́ШЧА**, гл. *Езярышча*.

**АЗЯРЫ́ШЧАНСКАЯ ВО́ЛАСЦЬ**, Азярышчанскае старостваа, дзярж. ўладанне ў ВКЛ у 14—18 ст. Займала прыкладна зах. палавіну сучаснага Гарадоцкага р-на Віцебскай вобл. ўздоўж р. Обаль (да ўпадзення ў яе р. Усыса). Першапачаткова А.в. у Віцебскім пав., кіравалася намеснікамі з віцебскага баярства. У 2-й пал. 15 ст. перападпарадкавана непасрэдна вял. князю. З сярэдзіны 16 ст. частка А.в. на правым беразе р. Обаль у Полацкім ваяв. З гэтага часу А.в. у гіст. крыніцах наз. староствам. З 1582 ва ўмоўным уладанні кн. Друцкіх-Саколінскіх. Пры іх зах. частка А.в. адасобілася ў самаст. Казьянскае староства, усх. ч. захавала назву Азярышчанскае (Езярышчанскае) староства. У 1772 А.в. адышла да Рас. імперыі і стала асн. ч. Гарадоцкага пав. У 19 ст. падаравана віцебскаму ваен. губернатару А. Вюртэмбергскаму і стала прыватным маёнткам. *В.Л.Насевіч.*

**АЗЯ́ТЫ**, вёска ў Беларусі, у Жабінкаўскім р-не Брэсцкай вобл. Цэнтр сельсавета. За 18 км на ПдУ ад г. Жабінка, 38 км ад Брэста. 620 ж., 242 двары (1994). Звераферма калгаса «Беларусь». Сярэдняя і муз. школы, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, дзіцячы сад, аддз. сувязі. Царква. Магіла ахвяр фашызму.

**АЙД**, Гадэс, Плутон, у грэч. міфалогіі бог — уладар царства мёртвых, а таксама само царства. А. — алімп. бажаство, але пастаянна знаходзіцца ў сваіх падземных уладаннях, дзе царуе з жонкай *Персефонай*. У хрысціянстве міф пра А. ператварыўся ў міф пра пекла, куды пасля смерці трапляюць душы грэшнікаў. Апісаны ў творах Гамера, Платона, Вергілія і інш.

**АЙДЫ** (лац. oidium, адз. л., памяншальнае ад грэч. ōon яйцо), артраспоры, споры вегетатыўнага размнажэння, якія ўтвараюцца пры распаданні гіфаў грыбніцы на асобныя дробныя клеткі ў некат. недасканалых і базідыяльных грыбоў. Пры ўтварэнні А. пад клетачнай абалонкай гіфаў закладваец-

Азярод на сялянскай сядзібе. Пач. 20 ст.

ца новая абалонка. Памеры А. ад 2,5 да 8 мкм.

**АІР**, Азбін (франц. Aïr, Azbine), пласкагор'е на Пн Сахары, у Нігеры. Сярэдняя выш. 800—900 м, найб. — да 1900 м (патухлы вулкан). Складзена са стараж. гранітаў і маладых лаваў. У далінах уэдаў — акацыевае калючадрэўе, на схілах — апустыненая саванна, вяршыні — голыя пустыні.

І.К.Айвазоўскі.

**АЙБЁК** (сапр. Ташмухамедаў Муса; 10.1.1905, Ташкент — 1.7.1968), узбекскі пісьменнік. Нар. пісьменнік Узбекістана (1965). Акад. АН Узбекістана (1943). Скончыў Сярэднеазіяцкі ун-т (1930). Першы зб. вершаў «Пачуцці» (1926). Асэнсаванне гіст. мінулага узб. народа, падзей 1-й сусв. і Вял. Айч. войнаў, праблем сучаснай вёскі — галоўнае ў зб-ках вершаў і паэм «Флейты сэрца» (1929), «Факел» (1932), «Песня сонца» (1955), «Палымяныя гады» (1965), сац.-псіхал. і гіст.-біягр. раманах «Свяшчэнная кроў» (1940), «Наваі» (1944, Дзярж. прэмія СССР 1946), «Сонца не пагасне» (1958), «Вялікі шлях» (1967), кнізе-дзённіку «Па фронце» (1965) і інш. Дзярж. прэмія Узбекістана імя Хамзы 1963 за аўтабіягр. аповесць «Дзяцінства» (1962).

*Тв.*: Собр. соч. Т. 1—5. Ташкент, 1985—87.

**АЙВА́** (Cydonia), род дрэў і кустоў сям. ружавых. 1 від — А. звычайная (C. oblonga). Вырошчваюць у Еўропе, Паўн. Амерыцы, Паўн. Афрыцы, Усх. Азіі. На Беларусі культывуюць як пладовую і дэкар. расліну, выкарыстоўваюць таксама як каранёвы прышчэп для грушы.

Дрэва або куст выш. 1,5—8 м, ва ўмовах Беларусі куст выш. 3—4 м. Лісце круглае, авальнае ці яйцападобнае, зверху цёмна-зялёнае, знізу шараватае, лямцавае. Кветкі адзіночныя, белыя, ружовыя, аранжавыя. Цвіце ў маі—чэрв., плады дробныя, залаціста-жоўтыя, апушаныя, выспяваюць у кастрычніку. Плады багатыя цукрамі, к-тамі, вітамінамі, эфірным алеем, з іх гатуюць варэнне, джэм, кампоты і інш. Размнажаецца насеннем і вегетатыўна. Святлалюбівая і засухаўстойлівая расліна.

**АЙВАЗО́ЎСКІ** (Гайвазоўскі) Іван Канстанцінавіч (29.7.1817, г. Феадосія — 2.5.1900), расійскі мастак. Марыніст. У 1833—37 вучыўся ў Пецярбургскай АМ, з 1887 яе ганаровы член. З 1845 жыў у Феадосіі. Творы А. вылучаюцца рамантычным бачаннем, багатай колеравай гамай, паказам складаных і эфектных з'яў прыроды, імкненнем да гераізацыі. Аўтар каля 6 тыс. карцін, малюнкаў, акварэляў, у т.л. «Дзевяты вал» (1850), «Бура на Паўночным моры» (1865), «Вясёлка» (1873), «Сярод хваляў» (1898) і інш. Пісаў таксама батальныя кампазіцыі: «Чэсменскі бой», «Наварынскі бой» (абедзве 1843); жанравыя палотны («Вяселле на Украіне», 1891); партрэты [А.М.Айвазоўская, 1882, «Развітанне Пушкіна з морам» (з І.Рэпіным), 1887] і інш. У 1880 заснаваў карцінную галерэю ў Феадосіі. У Нац. мастацкім музеі Беларусі зберагаюцца «Пётр I каля Краснай Горкі» (1846), «Ноч на востраве Родас» (1850), «Бура» (1852), «Месячны пейзаж» (1855), «Раніца на моры» (1883) і інш. *Б.А.Лазука.*

**АЙВЗ**, Айвс (Ives) Чарлз Эдвард (20.10.1874, г. Данберы, штат Канектыкут, ЗША — 19.5.1954), амерыканскі

Да арт. Аід. Аід і Персефона. Рэльеф з Локраў. 470—460 да н.э.

кампазітар. Выпрацаваў своеасаблівы кампазітарскі стыль, незалежны ад еўрап. традыцый. На аснове мелодый амер. песень і гімнаў стварыў арыг. сінтэз папулярнай і прафес. музыкі. Выкарыстоўваў наватарскія прыёмы, многія з якіх прадвызначылі пошукі кампазітараў Зах. Еўропы.

*Тв.*: Кантата «Нябесная краіна» (1889); 5 сімфоній (1898—1915), сюіты, увертюра, праграмныя п'есы для сімф. арк.; камерна-інстр. ансамблі; п'есы для аргана і фп.; хары, песні.

*Літ.*: Ивашкин А. Чарльз Айвз и музыка XX в. М., 1991.

Айва звычайная.

**АЙГУ́НСКІ ДАГАВО́Р 1858.** Падпісаны паміж Расіяй і Кітаем 28.5.1858 у г. Айгунь (цяпер г. Хэйхэ, Кітай) у выніку мірных перагавораў. Устанаўліваў мяжу па р. Амур. Да Расіі пераходзіў левы бераг Амура ад р. Аргунь да вусця; правы бераг Амура да р. Усуры заставаўся за Кітаем. Тэр. паміж р. Усуры і Японскім м. абвяшчалася агульным уладаннем Расіі і Кітая. У выніку Расіі вернута тэрыторыя, якая паводле *Нерчынскага дагавора 1689* адыходзіла да Цынскай імперыі. Плаванне па рэках Амур, Сунгары і Усуры дазвалялася толькі рас. і кіт. суднам. Канчаткова мяжа паміж Расіяй і Кітаем зацверджана Пекінскім дагаворам 1860.

**А́ЙДАХА** (Idaho), штат на ПнЗ ЗША. Уваходзіць у групу горных штатаў Далёкага Захаду. Пл. 214,3 тыс. км$^2$; нас. 1099 тыс. чал. (1993). Адм. ц. — г. Бойсе. Найб. гарады Айдаха-Фолс і Пакатэла. Гар. насельніцтва каля 50%. На б. ч. тэрыторыі адгор'і Скалістых гор (выш. да 3857 м), на З ускраіна Калумбійскага плато, на Пд пласкагор'е Вял. Басейн і раўніна р. Снейк. Клімат кантынентальны, змякчаецца Ціхім акіянам. Асн. галіны прам-сці: горназдабыўная (серабро, свінец, сурма, малібдэн, ртуць, золата, кобальт, ванадый, цынк, фасфаты, паўкаштоўныя камяні), харч. (асабліва перапрацоўка бульбы), лясная і дрэваапр., хім., радыёэлектронная, каляровая металургія. У таварнай прадукцыі сельскай гаспадаркі пераважае раслінаводства. Гал. культуры: бульба (каля 1/4 збору краіны), пшаніца, кукуруза, ячмень, цукр. буракі, хмель. Садоўніцтва (пераважна яблыкі). Пашавая жывёлагадоўля (буйн. раг. жывёла і авечкі). Транспарт аўтамаб., чыгуначны. Штат перасякаюць 2 транскантынентальныя чыг. магістралі. Развіты турызм.

**АЙДУКЕ́ВІЧ** (Ajdukiewicz) Казімеж (12.12.1890, г. Цярнопаль, Украіна — 12.4.1963), польскі логік, філосаф. Правадзейны чл. Польскай АН (з 1952). Праф. Львоўскага, Варшаўскага ун-таў (1925—38). У 1938 узначаліў Пазнанскае філас. т-ва, з 1953 гал. рэдактар час. «Studia logica» («Лагічныя даследаванні»). Прадстаўнік львоўска-варшаўскай школы, якая ставіла задачу лагічнага абгрунтавання і ўмацавання рацыяналізму ў процівагу ірацыяналізму. Паводле філас. поглядаў быў блізкі да ідэй лагічнага пазітывізму. Распрацаваў логіка-семантычную канцэпцыю значэння як спосабу ўжывання тэрміна ў пэўнай канцэптуальнай сіс-

тэме тэорыі лагічнага вываду, індуктыўнай логікі, азначэння, лагічнай семантыкі і сінтаксісу.

*Тв.:* Język i poznanie. T. 1—2. Warszawa, 1960—65: The scientific world-perspective and other essays, 1931—63. Dordrecht, 1978.

*Г.У.Грушавы.*

**АЙДЫ́Н** (сапр. Сабірава Манзура; 1906, Ташкент — 30.5.1953), узбекская пісьменніца. Скончыла Самаркандскі ун-т (1931). Жыццё узб. жанчыны, праблемы кахання і сям'і — асноўнае ў яе творах: зб-ках вершаў «Песні світанку» (1931), «Умелыя рукі» (1932), зб. апавяданняў «Дзяўчаты» (1943), «Шырын прыйшла» (1944), «Мужнасць-вечнасць» (1947), навел і нарысаў пра мінулае узб. народа, п'есе «Шлях да новага» (1925).

**А́ЙЗБЕРГ** Рома Яфімавіч (н. 16.6.1933, г. Арцёмаўск Данецкай вобл., Украіна), бел. геолаг. Д-р геолага-мінер. н. (1978), праф. (1990). Скончыў Новачаркаскі політэхн. ін-т (1956). З 1965 у Бел. н.-д. геолагаразведачным ін-це, з 1990 у Ін-це геал. навук АН Беларусі. Працы па класіфікацыі тэктанічных структур, геадынаміцы, тэктанічнай эвалюцыі зямной кары, тэктанічных крытэрыях размяшчэння карысных выкапняў. Дзярж. прэмія Беларусі 1978.

*Тв.:* Тектоника Белоруссии. Мн., 1976 (у сааўт.); Палеотектоника Белоруссии. Мн., 1983 (у сааўт.); Палеогеодинамические реконструкции платформенных бассейнов: Метод. аспекты. Мн., 1991 (у сааўт.); Геодинамические обстановки неогея территории Беларуси // Літасфера. 1994. № 1.

**АЙЗЕРМА́Н** Тэадор Ільіч (н. 14.5.1914, с. Жоўцень Адэскай вобл.), расійскі філосаф. Акад. АН СССР (1981, чл.-кар. 1968). Скончыў Маскоўскі ін-т філасофіі, л-ры і гісторыі (1938). Працаваў у МДУ, у Ін-це філасофіі АН СССР. Працы па гісторыі зах.-еўрап. філасофіі, тэорыі гіст.-філас. працэсу: «Праблемы гісторыка-філасофскай навукі» (1969, 2-е выд. 1982), «Асноўныя філасофскія кірункі» (1971), «Крызіс сучаснага ідэалізму» (1972) і інш. Чл. рэдкалегіі і адзін з аўтараў «Гісторыі філасофіі» (т. 1—6, 1957—65). Дзярж. прэмія СССР 1983.

**АЙКАНІ́МІКА** (ад грэч. oikos жыллё + onyma імя), раздзел *тапанімікі*, які вывучае айконімы — уласныя назвы паселішчаў.

**АЙКІДО́** (яп. літар. шлях спасціжэння гармоніі), разнавіднасць самаабароны без зброі. Адзін з найб. складаных у асваенні відаў *адзінаборстваў усходніх*. Сучасная сістэма А. створана яп. майстрам Марыхеі Уешыба (1883—1969). Прыёмы разлічаны на адбіццё нападу аднаго ці некалькіх праціўнікаў. Атакуючых прыёмаў ці дзеянняў у А. няма, таму спарт. спаборніцтвы не праводзяцца. На Беларусі развіваецца з пач. 1980-х г.

**АЙКУМЕ́НА**, экумена (грэч. oikumenē ад oikeō насяляю), сукупнасць заселеных людзьмі тэрыторый зямнога шара. У Стараж. Грэцыі вядомая грэкам заселеная частка зямлі з *Эладай* у цэнтры. Уключала Паўд., Цэнтр. і Паўд.-Усх. Еўропу да Каспійскага м., Малую і Пярэднюю (Зах.) Азію, Аравію, Індыю і Паўн. Афрыку. Паняцце «А.» ўвёў стараж.-грэч. гісторык і географ Гекатэй Мілецкі ў творы «Землеапісанне».

**АЙЛА́НТ** (Ailanthus), род лістападных дрэў сям. сімарубавых. 12—15 відаў. Пашыраны ў Паўд. і Усх. Азіі, на У Аўстраліі. На Чарнаморскім узбярэжжы Каўказа, у Закаўказзі, Малдавіі, Паўд.-Зах. Украіне і С. Азіі інтрадукаваны 3 віды. Найб. вядомы А. найвышэйшы, або кітайскі ясень (A.altissima).




Выш. 20—30 м. Лісце чаргаванае, складанае. Кветкі дробныя, у мяцёлчатых суквеццях, зеленавата-жоўтыя, з непрыемным пахам. Плод — сухая прадаўтаватая крылатка з адзіным зернем у сярэдзіне. Малапатрабавальныя да глебавых умоў, святлолюбівыя. Лек. расліны. Драўніна выкарыстоўваецца ў буд-ве, на выраб паперы. Лісцем А. ў Кітаі кормяць вусеняў айлантавага шаўкапрада.

**АЙЛІСЛІ́** Акрам (сапр. Наібаў-Айліслі Акрам Наджар аглы; н. 6.12.1937, с. Айліс Ардубадскага р-на, Азербайджан), азербайджанскі пісьменнік. Скончыў Літ. ін-т імя Горкага (1964). Аўтар зб-каў апавяданняў «Чарэшня» (1961), «З сэрцам не жартуй» (1973), аповесцяў «У гарах туман» (1963), «З бацькамі і без іх» (1965), «Над Курой у цёплых лясах» (1976), эсэ «Прага літаратуры» (1989) і інш. Цыкл аповесцяў «Людзі і дрэвы» (1966—68) пра жыццё азербайджанскай вёскі ў Вял. Айч. вайну і пасляваенныя гады. Прозе А. ўласцівы паглыблены псіхалагізм, спалучэнне лірызму з тонкім гумарам.

**АЙЛ-РО́ЯЛ** (Isle Royale), нацыянальны парк у ЗША, штат Мічыган. Засн. ў 1931. Знаходзіцца на воз. Верхняе (самае вял. прэснаводнае возера свету). Пл. каля 216 тыс. га, у т.л. 54 тыс. га сушы (в-аў Айл-Роял). Захоўваюцца першабытныя хвойныя і цвердалістыя лясы; бабры, разнастайная іхтыяфауна (46 відаў рыб) і арнітафауна (197 відаў птушак). Біясферны рэзерват.

**АЙМА́К**, 1) у манг. і цюрк. народаў першапачаткова вялікая ці малая група роднасных сем'яў, якія вялі сваё паходжанне ад аднаго продка і качавалі на адной тэрыторыі; пазней (у манголаў) буйны феад. ўдзел, ханства. 2) Адм.-тэр.

І.Айвазоўскі. Пётр I каля Краснай Горкі... 1846. Нацыянальны мастацкі музей Беларусі.

адзінка (раён) у Бураціі і на Алтаі. 3) Асн. адм.-тэр. адзінка Манголіі.

**АЙМА́НАЎ** Шакен Кенжатаевіч (15.2.1914 — 23.12.1970), казахскі акцёр і рэжысёр; адзін з пачынальнікаў нац. кіно. Нар. арт. СССР (1959). З 1933 у Казахскім т-ры драмы імя Аўэзава (Алматы). З 1940 у кіно. Выканаў ролю

Айні.

Джамбула ў аднайм. фільме; паставіў карціны «Паэма пра каханне», «Наш мілы доктар», «Зямля бацькоў», «Канец атамана» і інш. Дзярж. прэмія СССР 1952 і Дзярж. прэмія Казахстана 1968. Імя. А. прысвоена кінастудыі «Казахфільм».

**АЙМАРА́**, індзейскі народ у Балівіі, Перу і Чылі. Агульная колькасць 2,2 млн. чал. (1987). Мова аймара. Паводле веравызнання католікі.

**АЙНІ́** (сапр. Садрыдзін Саід-Мурадзада; 27.4.1878, кішлак Сактарэ, каля г. Гіждуван, Узбекістан — 15.7.1954), таджыкскі пісьменнік, вучоны. Ганаровы акад. АН Узбекістана (1943), 1-ы прэзідэнт АН Таджыкістана (з 1951). Вучыўся ў бухарскіх медрэсе. Пісаў на тадж. і узб. мовах. Прапагандаваў асв. ідэі. Аўтар зб. вершаў «Іскры рэвалюцыі» (1923). Талент А.-бытапісца выявіўся ў аповесці «Адзіна» (1924), раманах «Дахунда» (1930), «Рабы» (1935). Аўтар кн. «Успаміны» (кн. 1—4, 1949—54), прац па гісторыі і л-ры народаў Сярэдняй Азіі, пра творчасць Рудакі, Ібн Сіна, Фірдаўсі, Саадзі, Наваі і інш. Дзярж. прэмія СССР 1950.

*Літ.*: Айни Х. Жизнь Садриддина Айни: (краткий хронол. очерк). Душанбе, 1982.

**А́ЙНЫ**, народ на в-ве Хакайда ў Японіі, 20 тыс. чал. (1987). Асобная айнская раса, якая спалучае еўрапеоідныя, аўстралоідныя і мангалоідныя рысы. Мова айнская і японская. Паводле веравызнання будысты.

**АЙ-ПЕ́ТРЫ**, вяршыня Галоўнай грады Крымскіх гор, у масіве Ай-Петрынская Яйла Украіны. Стромка абрываецца да ўзбярэжжа Чорнага м. ў раёне Алупкі. Выш. да 1233 м. Складзена пераважна з вапнякоў. З А.-П. адкрываецца панарама б. ч. Паўд. берага Крыма.

**АЙРА́ВАТА**, у стараж.-індыйскай міфалогіі прабацька слановых. Паводле міфа, А. і яшчэ 7 слановых (дыгаджы), з'явіўшыся на свет з шалупіння яйка *Брахмы*, сталі захавальнікамі 8 напрамкаў (краін) свету. А. — захавальнік усходу, лічыцца баявым сланом *Індры*.

**АЙРА́ЦКАЕ ХА́НСТВА**, Джунгарскае ханства, феадальная дзяржава айратаў (група зах.-манг. народаў) у Джунгарыі (ч. тэр. сучаснага Паўн.-Зах. Кітая) у 17—18 ст. Склалася ў 1630-я г. ў выніку аб'яднання айрацкіх княстваў. Узмацнілася пры Батуры-хунтайджы [1635 — каля 1660]. З 1670-х г. вяло войны з маньчжурскімі феадаламі. У 1757—58, аслабленае працяглай феад. усобіцай, заваявана кітайскай дынастыяй Цын.

Карова айршырскай пароды.

**А́ЙРТАН** (Ireton) Генры (1611, Атэнбара, графства Нотынгемшыр, Англія — 28.11.1651), дзеяч англійскай рэвалюцыі 17 ст., ідэолаг памяркоўных *індэпендэнтаў*. Генерал парламенцкай арміі, паплечнік О.*Кромвеля*. З пач. грамадз. вайны ў 1642 выступіў на баку парламента супраць раялістаў, стаў адным з арганізатараў новай арміі. У 1645 выбраны ў Доўгі парламент. На канферэнцыі ў Патні (1647) гал. апанент левелераў, выступаў за захаванне караля і палаты лордаў, супраць ідэі «народакіравання». У 1648 дзеля захавання ўлады індэпендэнтамі стаў адным з арганізатараў і ўдзельнікаў суда над *Карлам I*, падпісаў яму смяротны прыгавор. У 1649 удзельнічаў у Ірландскім паходзе, лорд-правіцель Ірландыі (з 1650).

**АЙРШЫ́РСКАЯ ПАРО́ДА** буйной рагатай жывёлы. Малочнага кірунку. Выведзена ў 18 ст. ў Шатландыі ў графстве Эр (Ayr, Ayrshire) скрыжаваннем мясцовай жывёлы з шартгорнскай, джэрсейскай, гернзейскай і галандскай пародамі. Гадуюць у Расіі, ЗША, Канадзе, Фінляндыі, Швецыі, Вялікабрытаніі, Аўстраліі. Выкарыстоўваюць для скрыжавання з мясц. жывёлай, каб павысіць тлушчамалочнасць.

Жывёла нізкарослая, мае моцны і лёгкі касцяк, добра развітае вымя. Масць чырвонапярэстая. Жывая маса нованароджаных цялят 28—30 кг, ва ўзросце 12 месяцаў 240—260 кг, дарослых кароў 450—500 і быкоў 700—800 кг. Надой кароў за лактацыю 4200—5200 кг пры сярэдняй тлустасці малака 3,9—4,4%, рэкордны надой — больш за 10 тыс. кг. Сутачныя прыросты бычкоў на адкорме 750—800 г, забойны выхад дарослых жывёл 52—54%. *М.П.Грынь.*

**АЙРЭ́Н**, манастрафічны верш у армянскай сярэдневяковай паэзіі. Складаецца з чатырох 15-складовых радкоў, звязаных адной рыфмай. У сучаснай паэзіі А. напісаны многія лір. мініяцюры (дарчыя надпісы і інш.). У бел. паэзіі сустракаецца ў М.Танка («Айрэн»).

**А́ЙСБЕРГ** (англ. iceberg), ледзяная гара, вялікі масіў мацерыковага або шэльфавага лёду, які плавае ў акіяне, моры або ляжыць на мелі. Утвараецца ад абломвання ледавіка, што спускаецца ў ваду. Над вадой узвышаюцца да 70—100 м, б. ч. аб'ёму (да 90%) пад вадой. Асн. раёны ўтварэння А. — шэльфавыя ледавікі Антарктыды, а-вы Канадскага Арктычнага архіпелага, Грэнландыя. Могуць служыць крыніцай прэснай вады пры буксіроўцы да засушлівых прыбярэжных раёнаў Аўстраліі, Паўд. Амерыкі, Афрыкі і Аравійскага п-ва. Сутыкненне з А. — прычына гібелі многіх суднаў («Тытанік» у 1912, «Хедтафт» у 1959).




Утварэнне айсберга.

**АЙСО́РЫ**, гл. *Асірыйцы*.

**А́ЙСРЫЗЕНВЕЛЬТ**, (Eisriesenwelt), карставая пячора ва Усх. Альпах, у Аўстрыі, на Пд ад Зальцбурга. Буйнейшая ў Еўропе. Даўж. 42 км. Глыб. 407 м. Шматлікія залы са сталактытамі і сталагмітамі. Турызм.

**АЙ-ТАДО́Р**, мыс на Паўд. беразе Крыма, на Украіне, за 8,5 км на ПдЗ ад Ялты. Замыкае з З Ялцінскую бухту. Выш. каля 90 м. Вапняковае адгор'е г. Магабі, якое падае да Чорнага м. стромкімі абрывамі. На адным з іх замак «Ластаўчына гняздо» (канец 19 ст.). Рэшткі рымскага лагера Харакс (1—3 ст. н.э.).

**АЙТМА́ТАЎ** Чынгіз (н. 12.12.1928, кішлак Шэкер Кіраўскага р-на, Кыргызстан), кіргізскі пісьменнік. Нар. пісьменнік Кыргызстана (1968). Акад. АН Кыргызстана (1974). Скончыў Кіргізскі с.-г. ін-т (1953). У 1965—86 старшыня праўлення Саюза кінематаграфістаў Кыргызстана, з 1986 — Саюза пісьменнікаў Кыргызстана; адначасова з 1988 гал. рэдактар час. «Иностранная литература». З 1990 на дыпламат. службе. Вострыя этычныя і сац. праблемы сучаснасці, прасторавыя карціны дыялектычнай узаемасувязі свету і чалавека ўздымае ў аповесцях «Твар у твар» (1957), «Джаміля» (1958), «Тапольк мая ў чырвонай касынцы», «Вярблюджае вока», «Першы настаўнік» (усе 1961), «Матчына поле» (1963), «Бывай, Гюльсары» (1966), «Белы параход» (1970), «Рабы сабака, які бяжыць уздоўж мора» (1977); у раманах «І вякуе дзень даўжэй за век» (асобн. выд. пад назвай «Буранны паўстанак», 1980), «Плаха» (1986), «Божая маці ў снягах» (1988). У творах спалучае псіхал. аналіз з традыцыямі фальклору, міфічнай вобразнасцю, імкнецца да жанру прытчы. Амаль усе яго творы экранізаваны. Ленінская прэмія 1963. Дзярж. прэміі СССР 1968, 1977, 1983. Літ. прэмія «Этрурыя» (Італія, 1980), міжнар. прэмія імя Дж. Нэру (1985). Правадзейны чл. Еўрап. акадэміі навук, мастацтваў і л-ры (1983), Сусв. акадэміі навук і мастацтваў (1987). На бел. мову творы А. перакладалі І.Сакалоўскі, С.Міхальчук, М.Стральцоў.

*Тв.*: Собр. соч. Т. 1—3. М., 1982—84; Бел. пер. — Джаміля. Мн., 1962; Бывай, Гюльсары! Мн., 1971; Першы настаўнік. Мн., 1974; Буранны паўстанак: І вякуе дзень даўжэй за век. Мн., 1987.

*Літ.*: Базаров Г. Прикосновение к личности. 3 изд. Фрунзе, 1988; Гачев Г. Чингиз Айтматов. Фрунзе, 1989; Акматалиев А. Чингиз Айтматов и взаимосвязи литератур. Бишкек, 1991.

**АЙТЫ́ЕЎ** Гапар Айтыевіч (28.9.1912, с. Першы Тулейкен Ошскай вобл., Кыргызстан — 16.12.1984), кіргізскі жывапісец. Нар. мастак СССР (1971). Чл.-кар. АМ СССР (1974), Герой Сац. Працы (1982). Скончыў Кіргізскі ін-т асветы (1932), у 1935—38 вучыўся ў Маскве. Аўтар паэт. пейзажаў («Поўдзень на Ісык-Кулі», 1954; «Баваўнянае поле на поўдні Кіргізіі», пано, 1955; «Наваколле Андыжана», 1967), партрэтаў («Галерэя партрэтаў сучаснікаў», 1979), размалёвак і інш.

**АЙУ́НСКІ** (сапр. Сляпцоў) Платон Аляксеевіч [11.11.1893, Аляксееўскі р-н, Рэспубліка Саха (Якуція) — 31.10.1939], якуцкі пісьменнік і грамадскі дзеяч. У 1928—31 нарком асветы і аховы здароўя Якуціі, з 1935 дырэктар НДІ мовы і культуры. Адзін з пачынальнікаў якуцкай л-ры; прадстаўнік рамант. кірунку. Аўтар драм. паэмы «Чырвоны шаман» (1918), п'ес «Бальшавік» (паст. 1926), «Туйаарыма-Куо» (паст. 1928), аповесці «Выхад з твані» (1936), вершаў, апавяданняў; навук. прац «Якуцкая казка (аланхо), яе сюжэт і змест» (1927), «Пра тэорыю якуцкага вершаскладання» (1928), «Якуцкая мова і шляхі яе развіцця» (1935) і інш. Рэпрэсіраваны.

*Тв.*: Творы. Т. 1—7. Якуцк, 1958—62 (на якуцкай мове).

**АЙЦЫ́ ЦАРКВЫ́**, найбольш уплывовыя дзеячы хрысц. царквы 2—8 ст., якія стварылі яе дагматыку і арг-цыю. А.ц. наз. епіскапаў першых хрысц. абшчын, а з канца 4 ст. — аўтарытэтных царк. пісьменнікаў. Неабходныя ўмовы для прылічэння да А.ц. — прававернасць вучэння, прыналежнасць да *патрыстыкі*, прызнаная святасць іх жыцця. Прынята абмежаванне патрыстычнай эры Іаанам Дамаскінам (п. каля 748). А.ц., якія, паводле падання, перанялі вучэнне непасрэдна ад апосталаў, называюць Апостальскімі Айцамі (Клімент Рымскі, Ігнацій Антыяхійскі, Палікарп Смірнскі і Папій Іерапольскі). Падзяляюцца на зах. (лацінскіх) і ўсх. (грэчаскіх) у залежнасці ад мовы, на якой яны пісалі. Акрамя згаданых, сярод зах. А.ц. найбольш шануюцца Юсцін-філосаф, Ірыней Ліёнскі (2—3 ст.), Кіпрыян, Лактанцый (3—4 ст.), Ілярый Піктавійскі, Авросій Медыяланскі (4 ст.), Аўгусцін, Іеранім (4—5 ст.), папа Леў І Вялікі (5 ст.), папа Грыгорый Вялікі (6 ст.), Ісідар Севільскі (7 ст.); сярод усх. — Клімент Александрыйскі (2 ст.), Афанасій Вялікі (Александрыйскі), Яфрэм Сірын, Кірыла Іерусалімскі, Васіль Вялікі, Грыгорый Багаслоў, Грыгорый Ніскі, Іаан Златавуст (4 ст.), Кірыла Александрыйскі (5 ст.), Іаан Лесвічнік, Максім Вызнаўца (6—7 ст.). Многія творы А.ц. захаваліся цалкам ці фрагментарна, інш. вядомыя з крыніц па цытатах, пераказах або назвах. Творчасць А.ц. зрабіла вялікі ўплыў на фарміраванне хрысц. дагматыкі, літургічнага культу, традыцыяў, аскетызму. *І.М.Дубянецкая.*

Айсберг каля берагоў Грэнландыі.

**АЙ ЦЫН** (сапр. Цзян Хайчэн; н. 27.3.1910, павет Цзіньхуа правінцыі Чжэцзян, Кітай), кітайскі паэт. Першы зб. «Да Яньхэ» (1936). У зб-ках «Поўнач» (1939), «Вестка пра золак» (1943), «Ён памёр другі раз» (1946) і паэмах «Да сонца» (1938), «Факел» (1940) стварыў трагічны, з элементамі рамантызму, мастацкі свет, у якім супрацьстаяць сілы святла і цемры, праўды і хлусні. У ходзе кампаніі па барацьбе з іншадумствам (1957) аб'яўлены «правым элементам» і 16 гадоў знаходзіўся ў ссылцы. У 1978 вярнуўся да літ. і грамадскай дзейнасці. Выдаў зб-кі «Песня вяртання» (1980, роздум над гісторыяй чалавецтва і сваёй радзімы), «Лістапад» (1982), «Зарубежныя вершы» (1983), «Кароткія вершы» (1984), аўтабіягр. нарыс «Маё творчае жыццё» (1983). Яго лірыка адметная высокай грамадзянскасцю, філас. накіраванасцю, гуманізмам; выкарыстоўваў напеўную мелодыку нар. песень, строгія памеры класічных жанраў, перавагу аддаваў беламу вершу.

Ч.Айтматаў.

*Тв.*: Рус. пер. — Слово солнца: Избр. стихотворения. М., 1989.

**АЙЧЫ́М**, муж маці ў адносінах да яе дзяцей ад папярэдняга шлюбу; народны бацька.

**АЙЧЫ́НА**, гл. *Бацькаўшчына.*

**АЙЧЫ́ННАЯ ВАЙНА́ 1812**, прынятая ў рас. і сав. гістарыяграфіі назва *Вайны 1812.*

Г.Айтыеў. Навакольле Андыжана. 1967.

**АЙЧЫ́ННЫ ФРО́НТ**, форма аб'яднання масавых грамадска-паліт. арг-цый для вырашэння праблем нацый на пэўных этапах іх гіст. развіцця. Дзейнічалі ў Балгарыі (1942—89), Венгрыі (1944—89) і В'етнаме (з 1955). У А.ф. уваходзілі грамадзяне, паліт. партыі, рухі. У час 2-й сусв. вайны меў антыфаш. накіраванасць. У пасляваен. час дамінуючую ролю ў А.ф. набылі камуніст. партыі, прыкрываючы такім чынам сваю манаполію на ўладу.

А.ф. Балгарыі пасля рэарганізацыі (1948) аб'ядноўваў Балг. кампартыю, Балг. земляробчы нар. саюз, Дзімітраўскі камуніст. саюз моладзі, прафсаюзы; выдаваў газ. «Отечествен фронт». У Венгрыі А.ф. дзейнічаў пад кіраўніцтвам Венг. сацыяліст. рабочай партыі пад назвамі: Венг. фронт (з мая 1944), Венг. нац. фронт незалежнасці (са снеж. 1944), Венг. нар. фронт незалежнасці (з лют. 1949) і Айчынны нар. фронт (з 1954); выдаваў газ. «Magyar Nemzet» («Венгерская нацыя»), «Szabad Föld» («Свабодная зямля»). А.ф. В'етнама ў 1977 аб'яднаў Нац. фронт вызвалення Паўд. В'етнама (дзейнічаў з 1960), Саюз нац. дэмакр. і міралюбівых сіл Паўд. В'етнама (з 1968), асн. мэтай якіх было аб'яднанне краіны, а таксама камуніст., дэмакр., сацыяліст. партыі, прафсаюзы, жаночыя і маладзёжныя арг-цыі. *А.А.Чалядзінскі.*

**АЙЮБІ́ДЫ**, Эйюбіды, дынастыя султанаў, якая правіла на Б. Усходзе пасля падзення *Фатымідаў халіфата*. Засн. ў 1171 у Егіпце военачальнікам *Салах-ад-дзінам* (Саладзінам). Назву атрымала ад імя яго бацькі палкаводца Айюба. А. паспяхова змагаліся з крыжакамі. Пасля смерці Салах-ад-дзіна (1193) яго нашчадкі павялі барацьбу за султанат, у які ўваходзілі Егіпет, Сірыя, Хіджаз з Меккай і Медынай, ч. Месапатаміі. Міжусобіцы ўзмацнілі ролю гвардыі мамлюкаў, у выніку змовы якіх у 1250 быў скінуты апошні з А.

**А́ЙЯ**, мыс на Паўд. беразе Крыма, за 13 км на ПдУ ад Балаклавы (раён Севастопаля). З'яўляецца краем Гал. грады Крымскіх гор, які стромка абрываецца да Чорнага м. У раёне мыса рэліктавы бор хвоі Станкевіча.

**АКА́**, рака ў Еўрапейскай ч. Рас. Федэрацыі, самы вял. правы прыток Волгі. Даўж. 1500 км, пл. бас. 245 тыс. км$^2$. Пачынаецца ў цэнтр. ч. Сярэднярускага ўзвышша на выш. 226 м над узр. м. і ўпадае ў Волгу каля г. Ніжні Ноўгарад. Рэчышча звілістае, пойма шырокая, шмат старыц. Гал. прытокі: Угра, Масква, Клязьма (злева), Мокша (справа). Паводка з крас. да мая ў верхнім цячэнні і да пач. чэрвеня ў ніжнім. Летам і зімой межань, восенню дажджавыя паводкі. Пераважны гадавы сцёк вясной. Ледастаў з ліст. да красавіка. Сярэднегадавы расход вады ў вусці 1300 м$^3$/с. Рэгулярнае суднаходства ад г. Серпухаў да вусця (1200 км). На ўчастку ніжэй упадзення р. Масква на працягу 100 км шлюзаваная (Белаомутаўскі і Кузьмінскі гідравузлы). На левым беразе ў сярэднім цячэнні А. — Прыокска-тэрасны запаведнік. На А. — гарады Арол, Калуга, Серпухаў, Кашыра, Каломна, Рязань, Касімаў, Мурам, Паўлава, Дзяржынск, Ніжні Ноўгарад.

**АКА́БА**, заліў Чырвонага м., паміж п-авамі Аравійскім і Сінайскім. Даўж. 180 км, шыр. да 28 км, глыб. да 1828 м. Аддзелены ад Чырвонага м. падводным парогам глыб. да 958 м. Порты Акаба (Іарданія), Эйлат (Ізраіль).

**АКА́БА**, Эль-Акаба, горад на Пд Іарданіі. 32 тыс. ж. (1983). Порт у заліве Акаба Чырвонага м. Міжнар. аэрапорт. Вузел шашэйных дарог. Вытв-сць мінер. угнаенняў. Рамесная вытв-сць. Марскія промыслы, рыбалоўства. Марскі курорт.

**АКАБО́РЫ** Сіра (н. 20.10.1900, г. Сідзуока), японскі хімік-арганік і біяхімік. Чл. Японскай АН. Замежны член АН СССР (1966). Праф. (1938). Скончыў ун-т Тохаку (1925). З 1935 у Осакскім ун-це, у 1958 заснавальнік і першы дырэктар, рэктар Ін-та бялку пры ун-це; з 1967 адначасова прэзідэнт Ін-та фіз. і хім. даследаванняў. Навук. працы па сінтэзе аптычна актыўных рэчываў, вылучэнні і храматаграфічным аналізе амінакіслот і пептыдаў.

Да арт. Акад. Стэла цара Нарамсіна. 23 ст. да н.э.

**АКАВА́НГА** (Okavango), рака ў Афрыцы, гл. *Кубанга*.

**АКА́Д** (Akkad), Агадэ, стараж. горад (пазней і вобласць) на Пн *Месапатаміі*, на ПдЗ ад сучаснага Багдада (дакладнае месца невядома). Адзін з найстараж. цэнтраў семітычнага насельніцтва *Вавілоніі*. У 24—22 ст. да н.э. сталіца дзяржавы Саргана Стараж. (Акадскага), куды ўваходзілі Месапатамія і *Элам*. Каля 2200 да н.э. разгромлены гуціямі, страціў сваё значэнне.

Мастацтва А. пераняло і развівала маст. традыцыі Шумера. Аднак помнікі мастацтва А. (24—22 ст. да н.э.) адметныя большай разнастайнасцю тэм (фальклорныя, міфалагічныя сюжэты ў гліптыцы) і кампазіцый. Тыповымі з'яўляюцца многапланавыя аб'ёмныя рэльефы з экспрэсіўнай перадачай руху, элементамі пейзажу. Нешматлікія помнікі мастацтва А., што захаваліся, адносяцца да 23 ст. да н.э. (каменныя стэлы царою Саргана і Нарамсіна з плоскарэльефнымі ваеннымі сцэнамі, бронзавая галава правіцеля з *Ніневіі*, цыліндрычныя пячаткі са сцэнамі паляванння). Рэшткі палацавага комплексу Эшнуны (сучасны Тэль-Асмар) сведчаць аб высокім узроўні буд-ва.

**АКАДЗА́КІ**, горад у Японіі, на Пд в-ва Хонсю, у прэфектуры Айты (у агламерацыі Нагоя). 294 тыс. ж. (1987). Цэнтр тэкст. прам-сці. Хім., харч., маш.-буд. прадпрыемствы.

**АКАДЭ́М**, у грэчаскай міфалогіі афінскі герой, які паказаў *Дыяскурам*, дзе схавана іх сястра Алена, украдзеная Тэсеем. Лічылася, што А. пахаваны ў свяшчэнных садах паблізу Афін, дзе каля 387 да н.э. заснаваў філас. школу *Платон* (пазней названа «акадэміяй»).

**АКАДЭМІ́ЗМ** (франц. académisme), 1) чыста тэарэт. кірунак, традыцыяналізм у навуцы і асвеце. 2) Адарванасць навукі, мастацтва, асветы ад жыцця і грамадскай практыкі. 3) У выяўленчым мастацтве — кірунак, які склаўся ў маст. акадэміях 16—19 ст. (гл. ў арт. *Акадэміі мастацкія*) і прытрымліваўся традыцыйных правілаў класічнага мастацтва антычнасці і Адраджэння. Садзейнічаў сістэматызацыі маст. адукацыі, замацаванню класічных традыцый (гл. *Класіцызм*), якія ператвараліся ім у «вечныя» каноны. Лічачы, што сучаснае жыццё не вартае высокага мастацтва, А. проціпастаўляў яму надчасавыя і наднац. нормы прыгажосці, ідэалізаваныя вобразы, далёкія ад рэальнасці сюжэты (з ант. міфалогіі, Біблі), што падкрэслівалася ўмоўнасцю мадэліроўкі, колеру і малюнку, тэатральнасцю кампазіцыі. Пад націскам мастакоў-рэалістаў і творчай апазіцыі А. распаўся і відазмяніўся. У 20 ст. ў шэрагу краін ён часам выяўляўся ў адноўленых формах *неакласіцызму*.

**АКАДЭ́МІІ ВАЕ́ННЫЯ**, гл. ў арт. *Ваенныя навучальныя ўстановы*.

**АКАДЭ́МІІ МАСТА́ЦКІЯ**, установы (найчасцей дзярж.), якія з'яўляюцца навукова-творчымі цэнтрамі ў пытаннях класічных мастацтваў, а таксама вышэйшыя (часам прыватныя) маст. школы.

Першапачаткова А.м., што ўзніклі ў Італіі ў 16 ст., былі свабоднымі аб'яднаннямі мастакоў, якія вывучалі мастацтва антычнасці,

прыёмы майстроў Адраджэння і вял. значэнне надавалі малюнку як асн. форме мастацтва. Першая ўласна А.м. створана ў Парыжы ў 1648 як Каралеўская акадэмія жывапісу і скульптуры, дзе на аснове прынцыпаў класіцызму былі распрацаваны правілы т. зв. «вялікага стылю» прыдворнага арыстакратычнага мастацтва. На ўзор парыжскай створаны А.м. ў Вене (1692), Берліне (1694), Лондане (1768) і інш.

У 1757 створана першая рас. А.м. (Пецярбург; існавала да 1918). У ёй вучыліся і мастакі з Беларусі Л.Альпяровіч, С.Богуш-Сестранцэвіч, В.Ваньковіч, А.Гараўскі, Ф.Гарэцкі, Ф.Дмахоўскі, К.Кукевіч, Ф.Рушчыц, Н.Сілівановіч, Б.Тамашэвіч, І.Трутнеў, І.Хруцкі і інш. У 19 ст. многія А.м. ператварыліся ў цэнтры афіц. мастацтва і праваднікоў ідэаліст. эстэтыкі, сталі тормазам у развіцці прагрэсіўнага мастацтва. Паміж мастакамі-рэалістамі і прадстаўнікамі акад. мастацтва ішла барацьба (гл. *Перасоўнікі*). Пецярбургская А.м., як і многія інш., захавала сваё значэнне як школа прафес. майстэрства. У 19 ст. на Захадзе акадэміямі часам наз. прыватныя маст. студыі (акадэмія Жуліяна ў Парыжы) і інш. У 1933 у Ленінградзе створана як ВНУ Усерас. А.м., рэарганізаваная ў 1947 у А.м. СССР (Масква), з 1991 *Расійская акадэмія мастацтваў*. На Беларусі працуе (з 1991) *Беларуская акадэмія мастацтваў*.

**АКАДЭ́МІІ МУЗЫ́ЧНЫЯ**, 1) навукова-маст. аб'яднанні філасафаў, паэтаў, музыкантаў, аматараў мастацтва ў Італіі і інш. еўрап. краінах у 2-й пал. 15—17 ст. Існавалі як навукова-муз. т-вы, у дзейнасці якіх вял. значэнне надавалася музіцыраванню (акадэмія дэль Аркадыя ў Рыме), і муз. т-вы, якія аб'ядноўвалі прафес. музыкантаў і аматараў (займаліся навук. дзейнасцю, наладжвалі канцэрты, оперныя спектаклі, арганізоўвалі навуч. ўстановы, напр. Балонская філарманічная акадэмія). 2) Публічныя канцэртныя мерапрыемствы (арганізоўваліся муз. т-вамі) і аўтарскія канцэрты кампазітараў у 18 — 1-й трэці 19 ст. 3) Вышэйшыя муз. навуч. ўстановы (*Каралеўская акадэмія музыкі* ў Лондане, *Расійская акадэмія музыкі* ў Маскве, *Беларуская акадэмія музыкі*), некат. оперныя т-ры (Нацыянальная А. музыкі і танца ў Парыжы — *Парыжская опера*), а таксама навук., канцэртныя і інш. аб'яднанні муз. устаноў у 20 ст. (*«Санта-Чэчылія» акадэмія* ў Рыме). *В.А.Антаневіч.*

**АКАДЭ́МІІ НАВУ́К ХРЫБЕ́Т**, на Зах. Памірах, у Таджыкістане. Даўж. каля 110 км. Выш. да 7495 м (пік Камунізму). Складзены з асадкавых і метамарфічных парод, гранітаў. Водападзельны грэбень мае альпійскі рэльеф; 24 вяршыні ўзнімаюцца вышэй за 6000 м. Укрыты вечнымі снягамі, шмат ледавікоў (агульная пл. 660 км²), у т. л. буйныя — Гарма, Федчанкі, Язгулемскі і інш.

**АКАДЭ́МІК**, правадзейны член *Акадэміі навук Беларусі*, АН інш. дзяржаў, а таксама некаторых галіновых акадэмій. Выбіраецца на агульным сходзе акадэміі. Існуюць званні ганаровы А., замежны член і ганаровы член акадэміі. На Беларусі званне А. ўведзена 26.12.1928, калі СНК БССР зацвердзіў першы склад правадзейных членаў Бел. АН.

**АКАДЭМІ́ЧНАЕ ВЁСЛАВАЕ СУ́ДНА**, спартыўная вузкая падоўжаная лёгкая вёславая лодка. Мае вынесеныя за борты на кранштэйнах уключыны для вёслаў і рухомыя банкі-сядзенні. Адрозніваюць вучэбныя — тыпу клінкер (з абшыўкай канта на кант, бяспалубныя, адносна высакабортныя) і гоначныя — тыпу скіф (з абшыўкай угладзь, нізкабортныя, запалубленыя з носа і кармы); парныя (вясляр вяслуе двума вёсламі) і расхінныя (вясляр вяслуе адным вяслом). Парныя бываюць на 1, 2, 4 весляроў (адзіночкі, двойкі, чацвёркі), расхінныя — на 2, 4, 8 весляроў (двойкі, чацвёркі, васьмёркі).

**АКАДЭМІ́ЧНАЕ ВЫДА́ННЕ**, 1) выданне, якое змяшчае навукова вывераны тэкст і яго розныя варыянты, каментарыі і інш. даведачны апарат. Да А.в. належаць найб. поўныя зб. тв. класікаў л-ры, навукі, грамадскай думкі (напр., у 1991—95 АН Беларусі выдадзены Поўны зб. тв. М.Багдановіча; т. 1—3). 2) Выданні, якія публікуюцца акадэміямі.

**АКАДЭМІ́ЧНАЯ ГІМНА́ЗІЯ**, першая ў Расіі дзярж. свецкая сярэдняя агульнаадук. школа. Існавала ў 1726—1805. Засн. ў Пецярбургу пры Акадэміі навук для падрыхтоўкі моладзі ў *Акадэмічны універсітэт*. Спачатку мела ням. (3-гадовае) і лац. (2-гадовае) аддзяленні. Вывучалі лац., грэч., ням., франц. мовы, рыторыку, логіку, арыфметыку, гісторыю, геаграфію, маляванне. Поўны навуч. курс быў абавязковы для тых, хто рыхтаваўся ва ун-т, астатнім дазвалялася вывучаць прадметы на выбар. Узрост навучэнцаў не абмяжоўваўся. У 1758—65 А.г. ўзначальваў М.В.*Ламаносаў*. Закрыта ў сувязі з рэформай сістэмы нар. адукацыі.

**АКАДЭМІ́ЧНЫ ЛЕ́ТАПІС**, помнік бел.-літ. летапісання 16 ст., спіс 2-й рэдакцыі *Беларуска-літоўскага летапісу 1446*. Паводле складу і тэксту блізкі да *Супрасльскага летапісу*. У А.л. уваходзяць скарочаны агульнарус. летапіс, *Смаленская хроніка*, *«Пахвала Вітаўту»*, смаленскія пагадовыя запісы за 1432—46 і *«Летапісец вялікіх князёў літоўскіх»*. Ва ўрыўках збераглася частка па гісторыі Маскоўскай Русі 14 — 1-й трэці 15 ст. (пачынаецца са звестак 1339, згублены лісты з запісамі падзей 1373—1414 і 1418—27). Не збераглісяпач. частка, прысвечаная гісторыі Кіеўскай Русі, і *«Аповесць пра Падолле»*, што была змешчана ў канцы рукапісу. Тэкст Бел.-літ. летапісу 1446 месцамі перададзены недакладна, з памылкамі.

Летапіс уваходзіць у склад рукапіснага зборніка сярэдзіны 16 ст., які захоўваецца ў б-цы Рас. АН у Санкт-Пецярбургу. Апублікаваны ў 17-м (1907) і 35-м (1980) тамах Поўнага збору рус. летапісаў. *В.А.Чамярыцкі.*

**АКАДЭМІ́ЧНЫ ТЭ́АТР**, ганаровае званне, якое прысвойваецца тэатрам, што выпрацавалі трывалыя традыцыі і выхавалі на іх аснове выдатных акцёраў, стварылі спектаклі, якія атрымалі шырокае прызнанне.

Упершыню прысвоена ў 1919 шасці рус. т-рам — Вялікаму, Малому, Мастацкаму ў Маскве, Александрынскаму (т-р імя Пушкіна), Марыінскаму (т-р оперы і балета) і Міхайлаўскаму (Малы т-р оперы і балета) у Петраградзе. У 1920—90-я г. званне А.т. прысвоена лепшым драматычным і т-рам оперы і балета ў Маскве, Санкт-Пецярбургу, Кіеве, Харкаве, Казані, Ташкенце, Рызе, Таліне, Душанбе, Ашхабадзе і інш.

На Беларусі такое званне прысвоена 4 тэатрам: Нац. драм. т-ру імя Я.Купалы (1955), Бел. дзярж. драм. т-ру імя Я.Коласа (1977), Бел. т-ру оперы і балета (1964) і Дзярж. рус. драм. т-ру Беларусі (1994).

**АКАДЭМІ́ЧНЫ УНІВЕРСІТЭ́Т**, першая ў Расіі свецкая вышэйшая навуч. ўстанова. Існаваў у 1724—66. Засн. ў Пецярбургу адначасова з АН, заняткі пачаліся ў 1726. У А.у. пераводзілі лепшых вучняў са Славяна-грэка-лацінскай акадэміі і інш. духоўных навуч. устаноў. Змест навучання вызначаўся спецыяльнасцямі акадэмікаў, якія чыталі лекцыі. Статут 1747 абвясціў самастойнасць А.у. У 1750 уведзены экзамены, наладжана сувязь з *Акадэмічнай гімназіяй*. Лепшыя выпускнікі ун-та пераводзіліся ў ад'юнкты АН, атрымлівалі ступень магістра. У 1758—65, калі А.у. узначальваў М.В.*Ламаносаў*, утвораны ф-ты філас., юрыд., медыцынскі.

**АКАДЭ́МІЯ** (грэч. Akadēmia), назва навук., навуч., асветных, маст. устаноў і т-ваў. Слова «А.» паходзіць ад імя стараж.-грэч. міфічнага героя *Акадэма*, у гонар якога былі названы свяшчэнныя сады, дзе Платон каля 387 да н.э. заснаваў філас. школу (гл. *Акадэмія платонаўская*). У сярэднявеччы ў Еўропе і ў араб. краінах узніклі А. як навук. і навуч. ўстановы. У 15—16 ст. гэта назва замацавалася ў Італіі за рознымі т-вамі, якія вывучалі мову і л-ру; пазней узніклі падобныя т-вы прыродазнаўства, эксперым. метадаў даследавання. З 2-й пал. 17 ст. ствараюцца А. як навук. цэнтры (Акадэміі навук): Парыжская АН (1666), АН у Берліне (1700), Пецярбургская АН (1724), Рас. А. (Пецярбург, 1783). Важнае значэнне як навук. цэнтры маюць Нац. АН ЗША, Аўстрыйская, Шведская і інш. У Вялікабрытаніі ролю АН выконвае Лонданскае каралеўскае т-ва (1662). Цэнтр. навук. ўстанова Францыі — Ін-т Францыі (аб'ядноўвае 5 нац., у т.л. Парыжскую АН).

Старэйшая на тэр. Беларусі і Літвы — Віленская акадэмія, заснаваная ў 1579 (гл. *Віленскі універсітэт*). У 1775—81 існавала Гродзенская мед. акадэмія, на чале якой быў франц.

хірург і анатам Ж.Э.*Жылібер*. На базе Полацкага езуіцкага калегіума была створана *Полацкая акадэмія* (1812—20). У 1840 у маёнтку Горы-Горкі заснавана першая на Беларусі вышэйшая с.-г. навуч. ўстанова — *Беларуская сельскагаспадарчая акадэмія*. У 1957—61 у Мінску існавала Акадэмія с.-г. навук БССР. Вышэйшай навук. установай Рэспублікі Беларусь з'яўляецца Акадэмія навук Беларусі (засн. ў 1929). У 1991 засн. *Акадэмія кіравання*, якая займаецца навук. і навуч. дзейнасцю, у 1992 — *Акадэмія аграрных навук*. У 1993 створана недзярж. вышэйшая навуч. ўстанова *Акадэмія парламентарызму і прадпрымальніцтва*. Статус А. атрымалі некаторыя спец. ВНУ (гл. *Беларуская дзяржаўная політэхнічная акадэмія*, *Беларуская акадэмія мастацтваў*, *Беларуская акадэмія музыкі*, *Віцебская акадэмія ветэрынарнай медыцыны*, *Акадэмія міліцыі*, *Акадэмія фізічнага выхавання і спорту*).

**АКАДЭ́МІЯ КІРАВА́ННЯ** пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, дзяржаўная ўстанова па падрыхтоўцы, перападрыхтоўцы і павышэнні кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў. Засн. ў 1991 у Мінску пры СМ Беларусі, з 1994 — пры Кабінеце Міністраў, з 1995 — пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. У 1994/95 навуч. г. на базе вышэйшай адукацыі аддзяленні: павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў органаў дзярж. кіравання і мясц. Саветаў, павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў галін нар. гаспадаркі, юрыдычнае; на базе сярэдняй, сярэдняй спец. і вышэйшай адукацыі ф-т падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне эканомікі, кіравання, міжнар. эканам. адносін, знешнеэканам. дзейнасці і права. У складзе Акадэміі працуюць н.-д. цэнтры па праблемах эканомікі, удасканалення кіравання, дзярж. кадравай палітыкі, службы ў дзярж. апараце, радыяцыйнай бяспекі, энергетыкі і радыеэкалагічнай адукацыі, а таксама Міжнар. цэнтр дзелавога супрацоўніцтва і падрыхтоўкі менеджэраў. Навучанне дзённае, вочна-завочнае, завочнае; платнае. З 1992 аспірантура і савет па абароне кандыдацкіх і дактарскіх дысертацый. Дактарантура з 1993.

**АКАДЭ́МІЯ МІЛІ́ЦЫІ** Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь, вышэйшая навуч. ўстанова. Засн. ў 1976 як Мінская Вышэйшая школа міліцыі на базе завочнага ф-та (з 1958) Маскоўскай Вышэйшай школы міліцыі МУС СССР, з 1992 — акадэмія. Рыхтуе: юрыстаў-прававедаў — следчых, экспертаў-крыміналістаў, судова-мед. экспертаў; аператыўных работнікаў крымінальнага вышуку, службаў барацьбы з эканам. і арганізаванай злачыннасцю, папраўча-прац. устаноў і спец. камендатур, падраздзяленняў падатковых расследаванняў; участковых інспектараў міліцыі. У 1994/95 навуч. г. ф-ты: крымінальнай міліцыі і міліцыі грамадскай бяспекі; следча-экспертны; падрыхтоўкі супрацоўнікаў папраўча-прац. устаноў і спец. камендатур; судова-мед. экспертызы; завочнага навучання; павышэння кваліфікацыі; ваенны. Навучанне дзённае і завочнае. З 1993 ад'юнктура, у т.л. ін-т суіскальніцтва; дактарантура. Прымае да абароны кандыдацкія і доктарскія дысертацыі.

**АКАДЭ́МІЯ НАВУ́К БЕЛАРУ́СІ**, вышэйшая навуковая самакіравальная ўстанова, якая ажыццяўляе і каардынуе фундаментальныя і пошукавыя даследаванні ў Рэспубліцы Беларусь па асн. кірунках прыродазнаўчых, тэхн. і грамадскіх навук. Заснавана 1.1.1929 у Мінску на базе *Інстытута беларускай культуры* (Інбелкульта) паводле пастановы ЦВК і СНК БССР ад 13.10.1928. Да 1936 наз. Беларуская АН (БАН), да 1991 — АН БССР. У 1932 у Акадэміі было 14 ін-таў. У канцы 1920-х — 1930-я г. па надуманых абвінавачаннях было рэпрэсіравана больш як 140 супрацоўнікаў АН (у т.л. акадэмікі Г.І.Гарэцкі, П.В.Горын, А.Д.Дубах, М.М.Дурнаво, В.Ю.Ластоўскі, Я.Лёсік, С.М.Некрашэвіч, У.І.Пічэта, А.І.Смоліч, Б.А.Тарашкевіч, М.М.Шчакаціхін і інш.), што адмоўна адбілася на развіцці ўсіх навук. кірункаў. Найбольш пацярпелі гуманіт. навукі, дзе поруч са знішчэннем буйных бел. грамадазнаўцаў ліквідавана і распрацаваная імі навук. метадалогія, месца якой у гуманіт. даследаваннях 1930—50-х г. занялі празмерна гнуткія прынцыпы тагачаснай паліт. практыкі. У 1941 у АН было 12 н.-д. устаноў, у т.л. 9 ін-таў. У гады Вял. Айч. вайны АН панесла вял. людскія, матэрыяльныя і культ. страты (толькі матэрыяльны ўрон склаў больш за 300 млн. руб. у тагачасных цэнах). За 1-е пасляваеннае 10-годдзе адноўлены даваен. навук. ўстановы і створаны новыя. Сусв. навук.-тэхн. рэвалюцыя ў

Акадэмія навук Беларусі. Галоўны корпус.

Да арт. Акадэмія навук Беларусі. У лабараторыі ядзернай спектраскапіі Інстытута фізікі.

1960—80-я г. дала значны імпульс далейшаму развіццю АН, абумовіла стварэнне многіх новых установ фізіка-матэм. і тэхн. профілю. На 1.1.1991 у АН працавалі 17 093 чал., у т.л. 5967 навук. работнікаў, 55 акад., 96 чл.-кар., 375 д-роў і 2557 канд. навук. Перабудовачныя працэсы 1980-х г. і эканам. крызіс пач. 1990-х г. паўплывалі на змяншэнне аб'ёму даследаванняў. На 1.1.1995 у складзе АН 11 218 супрацоўнікаў, у т.л. 4747 навук. работнікаў, 65 акад., 99 чл.-кар., 444 д-ры і 2139 канд. навук. Кіраванне работай АН ажыццяўляюць прэзідэнт і выбарны калегіяльны орган — Прэзідыум АН. Мае 6 аддзяленняў, якія аб'ядноўваюць н.-д. ўстановы па розных галінах навукі.

У аддзяленні фізікі, матэматыкі і інфарматыкі (ін-ты: фізікі; малекулярнай і атамнай фізікі; прыкладной оптыкі; матэматыкі; фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў; электронікі; тэхнічнай кібернетыкі; аддзел аптычных праблем інфарматыкі; Вылічальны цэнтр) вядуцца распрацоўкі ў галіне лазернай фізікі, аптычных метадаў даследавання прыродных і штучных асяроддзяў, фундаментальных узаемадзеянняў у фізіцы палёў, часціц і атамных ядраў, фізікі плазмы і плазменных тэхналогій, стварэння новых перспектыўных матэрыялаў, дыферэнцыяльных ураўненняў, вылічальнай матэматыкі, алгебры, новых інфарм. тэхналогій і інш. У аддзяленні фізіка-тэхнічных праблем машынабудавання і энергетыкі (ін-ты: праблем энергетыкі; радыяцыйных фізіка-хімічных праблем; радыеэкалагічных праблем; фізіка-тэхнічны; прыкладной фізікі; тэхналогіі металаў; тэхнічнай акустыкі; механікі металапалімерных сістэм; надзейнасці машын; акад. навук. комплекс «Ін-т цепла- і масаабмену імя А.В.Лыкава»; інжынерны цэнтр «Плазматэр»; навук.-тэхн. цэнтр «Нетрадыцыйная энергетыка і энергазберажэнне», навук. цэнтр праблем механікі машын і аддзел праблем рэсурсазберажэння) вядуцца даследаванні ў галіне цепла- і масапераносу ў капілярна-порыстых целах, дысперсных сістэмах, рэалагічных асяроддзях, турбулентных патоках і ў нізкатэмпературнай плазме, фізікі, хіміі і трыбалогіі паверхні, тэхналогіі атрымання і апрацоўкі металічных, палімерных, кампазіцыйных і звышцвёрдых матэрыялаў, механікі мабільных машын і надзейнасці, цеплафізікі ліцейных працэсаў, распрацоўкі фізічных прынцыпаў і сродкаў дыягностыкі неразбуральнага кантролю рэчываў, матэрыялаў, вырабаў і тэхпрацэсаў і інш. У аддзяленні хімічных і геалагічных навук (ін-ты: агульнай і неарганічнай хіміі; біяарганічнай хіміі; геалагічных навук; праблем выкарыстання прыродных рэсурсаў і экалогіі; фізіка-арганічнай хіміі; Рэсп. навук.-тэхн. цэнтр «Экамір»; Хіміка-тэхналагічны цэнтр) вядуцца даследаванні ў галіне фізіка-хіміі палімераў і арган. сінтэзу, сінтэзу высокаактыўных і селектыўных адсарбентаў і каталізатараў, прыроды паверхневых з'яў і дысперсных сістэм, структурных асноў функцыянавання бялкоў і нуклеінавых кіслот, распрацоўкі рацыянальных падыходаў да накіраванага сінтэзу і вылучэння біялагічна важных злучэнняў, ацэнкі, прагназавання і аптымізацыі ўздзеяння натуральных і антрапагенных фактараў на прыроднае асяроддзе, стварэння рэсурсазберагальных тэхналогій здабычы, перапрацоўкі і выкарыстання цвёрдых гаручых выкапняў, будовы і эвалюцыі зямной кары і прыроднага асяроддзя на тэр. Беларусі. У аддзяленні біялагічных навук (ін-ты: генетыкі і цытагогіі; заалогіі; лесу; мікрабіялогіі; радыебіялогіі; фотабіялогіі; эксперыментальнай батанікі; Цэнтр. батанічны сад) вядуцца даследаванні ў галіне дынамікі супольнасцяў раслін і жывёл Беларусі, біял. рэсурсаў, асновы іх узнаўлення, рацыянальнага выкарыстання і аховы, генетычных і фізіёлага-біяхімічных праблем селекцыі, прадукцыйнасці і імунітэту раслін, генетычнай і клетачнай інжынерыі раслін і мікраарганізмаў, выкарыстання мікраарганізмаў у біятэхналогіі, сельскай гаспадаркі і аховы навакольнага асяроддзя, экалагічнай абстаноўкі, абумоўленай катастрофай на Чарнобыльскай АЭС, медыка-біял. і генетычных вынікаў радыяцыі, спосабаў зніжэння яе шкоднага ўздзеяння і інш. У аддзяленні гуманітарных навук (ін-ты: гісторыі; літаратуры; мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; мовазнаўства; сацыялогіі; філасофіі і права; эканомікі; аддзел навук. інфармацыі па гуманітарных навуках) вядуцца даследаванні ў галіне вывучэння гісторыі бел. народа, яго мовы і л-ры, заканамернасцяў развіцця бел. мастацтва, матэрыяльнай культуры і побыту народа, гісторыі і тэорыі вуснапаэт. творчасці, праблем этн. і мед. антрапалогіі беларусаў, распрацоўкі сацыялагічнай мадэлі сац. і паліт. працэсаў ва ўмовах пераходу грамадства ад таталітарнай да дэмакратычнай сістэмы рыначнага тыпу, вывучэння гісторыі філас. і паліт.-прававой думкі, заканамернасцяў грамадскага развіцця, фарміравання дэмакр. дзярж. і паліт. сістэмы Рэспублікі Беларусь, распрацоўкі нац.-дзярж. мадэлі эканомікі Беларусі і механізму яе дзярж. рэгулявання і інш. У аддзяленні праблем медыцыны (ін-ты біяхіміі; фізіялогіі) вядуцца даследаванні ў галіне асаблівасцяў уздзеяння фактараў сучасных экасістэм і ладу жыцця на здароўе чалавека; вывучаюць праблемы аховы генафонду насельніцтва краіны, патагенезу асн. захворванняў чалавека, стварэння новых метадаў дыягностыкі, прафілактыкі і лячэння сардэчна-сасудзістых, анкалагічных, нервовых, эндакрынных і інш. хвароб. Некаторыя ўстановы АН знаходзяцца або маюць свае рэгіянальныя аддзяленні ў абл. цэнтрах.

Для забеспячэння ўкаранення вынікаў навук. даследаванняў і навук.-тэхн. распрацовак у АН створана доследна-канструктарская база, у складзе якой: Цэнтр. канструктарскае бюро, канструктарскае аддзяленне з доследнымі

Да арт. **Акадэмія навук Беларусі.** У музеі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору.

Да арт. **Акадэмія навук Беларусі.** У лабараторыі экалогіі наземных жывёл Інстытута заалогіі.

выв-сцямі; 10 спец. канструктарскіх бюро з доследнымі выв-сцямі пры ін-тах. У сістэме АН выдавецка-паліграфічнае вытворчае аб'яднанне «Беларуская навука», *Бібліятэка цэнтральная навуковая імя Я.Коласа*, Цэнтральны навук. архіў, музеі стараж.-бел. культуры, гісторыі АН Беларусі. АН выдае «Даклады АН Беларусі», *«Весці АН Беларусі»* (5 серый), часопісы «Дифференциальные уравнения», «Инженерно-физический журнал», *«Журнал прикладной спектроскопии»*, часопіс «Трение и износ», шматтыражную газ. «Навіны АН Беларусі». Падрыхтоўка навуковых кадраў вядзецца праз дактарантуру і аспірантуру. Асобныя вынікі даследаванняў АН прызнаны сусв. супольніцтвам вучоных як навук. адкрыцці (ультрагукавы капілярны эфект адкрыў акад. Я.Р.Канавалаў, 1972; з'яву рухомасці падвойных сувязяў у спалучаных дыёнавых злучэннях — акад. А.А.Ахрэм разам з вучонымі з Масквы і Новасібірска, 1975; з'яву стабілізацыі-лабілізацыі электронна-ўзбуджаных шмататамных малекул — акад. М.А.Барысевіч і праф. Б.С.Непарэнт, 1978; бакавы зрух праменя пры адбіцці святла — акад. Ф.І.Фёдараў, 1980, і інш.). Многія навук. распрацоўкі знайшлі шырокае прымяненне ў нар. гаспадарцы Беларусі, у т.л. новыя матэрыялы і тэхналогіі, унікальныя прыборы і высокапрадукцыйныя гатункі культ. раслін.

Прэзідэнты АН: У.М.Ігнатоўскі (1929—31), П.В.Горын (1931—36), І.З.Сурта (1936—37), К.В.Гораў (1938—47), А.Р.Жэбрак (1947), М.І.Грашчанкаў (1947—51), В.Ф.Купрэвіч (1952—69), М.А.Барысевіч (1969—87), У.П.Платонаў (1987—92), Л.М.Сушчэня (з 1992).

*Літ.:* Купревич В.Ф. Академия наук Белорусской ССР: Очерк истории и деятельности. 3 изд. Мн., 1968; Акадэмія навук Беларускай ССР. Мн., 1979; Токарев Н.В. Академия наук Белорусской ССР: годы становления и испытаний (1929—45). Мн., 1988; Академия наук Белорусской ССР: Краткий очерк. Мн., 1989; Інстытут беларускай культуры. Мн., 1993. *В.К.Шчэрбін.*

**АКАДЭ́МІЯ ПАРЛАМЕНТАРЫ́ЗМУ І ПРАДПРЫМА́ЛЬНІЦТВА**, недзяржаўная вышэйшая навуч. ўстанова. Адкрыта ў 1993 у Мінску. Рыхтуе палітолагаў-менеджэраў і эканамістаў-менеджэраў. У 1994/95 навуч. г. ф-ты: сацыяльна-эканам. і перападрыхтоўкі кадраў. Навучанне дзённае, вячэрняе, завочнае; платнае. У складзе акадэміі н.-д. цэнтр па праблемах аналізу і прагназіравання сац.-эканам. і паліт. працэсаў у Рэспубліцы Беларусь. *А.І.Осіпаў.*

**АКАДЭ́МІЯ ПЛАТО́НАЎСКАЯ**, старажытнагрэчаская філас. школа. Засн. Платонам каля 387 да н.э. каля Афін. Існавала да 529 н.э. Сцвярджала традыцыю аб'ектыўнага *ідэалізму*. У гісторыі А.п. вылучаюць: Стараж. акадэмію (Платон, Спеўсіп, Ксенакрат), якая падтрымлівала піфагарэізм і распрацоўвала праблемы матэматыкі, натурфіласофіі, дыялектыкі; Сярэднюю (Аркесілай, Лакід) і Новую (Карнеад) акадэміі, якія з пазіцый *скептыцызму* выступалі супраць вучэння стоікаў; т. зв. 4-ю і 5-ю акадэміі, якія эклектычна злучалі платонаўскі ідэалізм са *стаіцызмам*, піфагарэізмам, арыстацелізмам. З 4 ст. А.п. развівала вучэнне неаплатанізму. У эпоху Адраджэння А.п. адноўлена ў Фларэнцыі (1459—1521; М.Фічына, Піка дэла Мірандала). Ідэі А.п. на Беларусі знайшлі адлюстраванне ў поглядах Ф.Скарыны, С.Буднага і інш. *Г.У.Грушавы.*

**АКАДЭ́МІЯ РУ́СКАГА БАЛЕ́ТА** імя А.Я.Ваганавай, адна са старэйшых рус. балетных школ. Засн. ў 1738 у Санкт-Пецярбургу як Танц. школа, з 1779 у складзе тэатр. вучылішча, у 1924—92 Ленінградскае харэагр. вучылішча; з 1957 імя Ваганавай, з 1961 акадэмічнае. Рыхтуе артыстаў класічнага балета, танц. ансамбляў. Тэрмін навучання 8 гадоў (прымаюцца дзеці з 10 гадоў). Разам з вышэйшай прафес. падрыхтоўкай дае агульнаадукацыйную ў аб'ёме сярэдняй школы. Сярод выкладчыкаў вучылішча І.Вальберх, М.Петыпа, М.Фокін, А.Ваганава. Сярод выпускніковў Т.Карсавіна, В.Ніжынскі, В.Спясіўцава, М.Сямёнава, Г.Уланава, Н.Дудзінская, Ф.Лапухоў, В.Вайнонен, Л.Лаўроўскі, Р.Захараў, Л.Якабсон, Ю.Грыгаровіч, І.Калпакова, М.Барышнікаў, Р.Нурыеў, М.Далгушын і інш.

**АКАДЭ́МІЯ ФІЗІ́ЧНАГА ВЫХАВА́ННЯ І СПО́РТУ**, вышэйшая навуч. ўстанова. Засн. ў 1937 у Мінску як Бел. ін-т фіз. культуры на базе Мінскага тэхнікума фіз. культуры, з 1993 акадэмія. У 1994/95 навуч. г. ф-ты: аздараўленчай і лячэбнай фізкультуры, пед., трэнерскі, завочнага навучання, павышэння кваліфікацыі. Навучанне дзённае і завочнае. Аспірантура з 1966. Прымае да абароны кандыдацкія і дактарскія (з 1992) дысертацыі.

**АКА́ЕЎ** Аскар (н. 10.11.1944, с. Кызыл-Байрак Кемінскага р-на, Кыргызстан), дзярж. дзеяч Кыргызстана, вучоны. Акад. АН Кыргызстана (1987). Д-р тэхн. н. (1980). Скончыў Ленінградскі ін-т дакладнай механікі і оптыкі (1968). Працаваў у ім, на з-дзе ў Бішкеку, у Фрунзенскім політэхн. ін-це. У 1986—87 заг. аддзела ЦК Кампартыі Кіргізіі. З 1987 віцэ-прэзідэнт, у 1989—90 прэзідэнт АН Кыргызстана. З 1990 прэзідэнт Рэспублікі Кыргызстан. Навук. працы па фіз. оптыцы і галаграфіі.

**АКАЗІЯНАЛІ́ЗМ** (ад лац. occasionalis выпадковы), ідэалістычны кірунак зах.-еўрап. філасофіі 17 ст., які сцвярджаў немагчымасць узаемадзеяння душы і цела без прамога ўмяшання Бога. Прадстаўнікі А. (А.Гейлінкс, Н.Мальбранш) ідэалістычна перапрацавалі дуаліст. філасофію Р.Дэкарта (гл. *Картэзіянства*). А. тлумачыў механістычнае прыродазнаўства ў рэліг., ідэаліст. духу, што адкрывала шлях да паслясхаластычнага абнаўлення рэліг. філасофіі. Гэта абумовіла папулярнасць А. сярод прыхільнікаў каталіцызму. На Беларусі ідэі А. вядомыя з пач. 18 ст. У сярэдзіне 18 ст. ў навуч. установах у лекцыі па схаластычнай філасофіі ўключаліся і элементы А. Вучэнне А. з пазіцый паслядоўнага механістычнага дэтэрмінізму крытыкаваў і абвяргаў Б.*Дабшэвіч.*

*Г.У.Грушавы.*

**Акадэмія фізічнага выхавання і спорту. Галоўны корпус.**

**АКАЗІЯНАЛІ́ЗМ**, моўная з'ява, якая не адпавядае агульнапрынятаму ўжыван-

ню; ствараецца як выразны сродак у пэўным кантэксце і не замацоўваецца як моўная норма. А. — звычайна словы («вершаправод», «ночапіс», «шалёнагубая»), але магчыма выкарыстанне асобных формаў у якасці новых слоў («соў», «савя» замест літ. «сава», «статуй» — «статуя») і словалучэнняў («мяцеляцца спіцы», «навальніцы ракет»). Найчасцей утвараюцца пісьменнікамі, таму інакш наз. аўтарскімі, індывідуальна-стыліст. *неалагізмамі*. Набываюць значэнне паэт. *тропаў*.

**А́КАЛІ**, паселішча эпохі неаліту, бронзы і ранняга жалеза (3—1-е тыс. да н.э.) на р. Акалі ў Эстоніі. Знойдзены прылады працы, кераміка, упрыгожанні розных культур (нарвенскай, тыповай грабеньчата-ямкавай, шнуравой і інш.), якія часткова былі пашыраны і на Пн Беларусі.

**АКА́ЛІНА**, прадукт акіслення паверхні металаў, сплаваў пры ўзаемадзеянні з вонкавым асяроддзем. Звычайна А. наз. прадукт акіслення жалеза і яго сплаваў. У шырокім сэнсе А. — хім. злучэнні, утвораныя на паверхні любога металу пры яго рэакцыі з акісляльнікамі (кіслародам, серай, азотам і інш.). Пагаршае якасць паверхні і прыводзіць да страты металу (каля 6%); у некаторых выпадках выкарыстоўваюць яе ахоўныя ўласцівасці (гл. *Аксідаванне*). А., што ўтвараецца на паверхні металу ў час пракаткі, коўкі, штампавання, выкарыстоўваецца ў канвертарнай, доменнай ці мартэнаўскай вытв-сці. З А. кіпячых сталяў атрымліваюць жалезны парашок, які выкарыстоўваюць у магн. дэфектаскапіі, парашковай металургіі. Спец. апрацоўкай з А. легіраваных сталяў і сплаваў вылучаюць каштоўныя металы. А. здыма́юць мех. спосабам, траўленнем ці электрагідраўлічнай апрацоўкай.

**АКАЛІ́ЧНАСЦЬ**, даданы член сказа, які паясняе словы са значэннем дзеяння або прыкметы, паказваючы на час, месца, прычыну, умову, мэту, спосаб дзеяння, характар выяўлення, інтэнсіўнасць прыкметы. У бел. мове А. сінтаксічна звязваюцца з гал. словамі пры дапамозе прымыкання і кіравання. Ролю А. выконваюць прыслоўе («вельмі здольны»), дзеепрыслоўе («разглядаць не спяшаючыся»), інфінітыў («зайсці развітацца»), назоўнік з прыназоўнікам ці без яго («ехаць лесам», «зрабіць насуперак жаданню»), лічэбнік («уваходзіць па аднаму»), а таксама свабодныя словалучэнні розных тыпаў («важыць тры тоны», «чытаць з ранку да вечара», «апрацаваны з дапамогай новага прыстасавання») і фразеалагізмы («жыць абы дзень да вечара»). У залежнасці ад сінтаксічнага значэння падзяляюцца на разрады — А. часу, прычыны, умовы, мэты, спосабу дзеяння і інш.

*А.Я.Міхневіч.*

**АКАЛО́ВА**, вёска ў Беларусі, у Лагойскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 35 км на Пн ад Лагойска, 74 км ад Мінска, 60 км ад чыг. ст. Смалявічы, на шашы Мінск—Віцебск. 103 ж., 51 двор (1994). Лясніцтва, сярэдняя школа.

У 1770 мястэчка ў Барысаўскім пав. У 1798 пісар ВКЛ М.Валовіч заснаваў драўляны касцёл. У 1880 мястэчка Прусавіцкай вол., 268 ж., касцёл, 3 крамы. З 1924 цэнтр сельсавета Плешчаніцкага р-на, у 1926—35 цэнтр нац. польскага сельсавета. З 1962 у Лагойскім р-не.

**АКАЛО́ВІЧ** Іван Ільіч (н. 15.6.1922, в. Малыя Жаберычы Крупскага р-на Мінскай вобл.), поўны кавалер ордэна Славы. У Вял. Айч. вайну на фронце з 1943. Удзельнік Курскай бітвы 1943, вызвалення Беларусі, баёў ва Усх. Прусіі. Вызначыўся: у чэрв. 1944 у час прарыву варожай абароны на ПнЗ ад Рагачова; у пач. 1945 у 3-дзённых баях каля г. Гумбінен; у сак. 1945 пры ліквідацыі ўсх.-прускай групоўкі праціўніка.

А.Акаеў.

**АКАЛО́ДАК**, акалотак, 1) у Рас. імперыі частка (раён) горада, якая замацоўвалася за паліцэйскім чынам (акалодачным наглядчыкам) для адм. і паліт. нагляду за насельніцтвам. Сістэма акалодачнага паліцэйскага нагляду ўведзена паводле паліцэйскай рэформы 1862, была адным з яе элементаў; існавала да 1917. 2) Лекарскі пункт пры вайсковых часцях, падраздзяленнях, лазарэтах у царскай арміі.

**АКАМАДА́ЦЫЯ** (ад лац. accomodatio прыстасаванне), розная ступень прыпадабнення суседніх зычных ці галосных; адзін з відаў *камбінаторных змяненняў гукаў*. Пры максімуме А. паміж імі ўзні-

Да арт. **Акадэмія фізічнага выхавання і спорту.** Заняткі ў зале біямеханічнай стымуляцыі.

каюць т. зв. глайды (прамежкавыя напаўгалосныя гукі), якія з'яўляюцца рэалізацыяй агульных для зычных і галосных дыферэнцыяльных адзнак. Для стараж. моў ступень А. вызначаецца на аснове ўскосных паказчыкаў, для сучасных — інструментальна або з дапамогай аўдытара. Прыкладам А. можа служыць бел. *цеканне* і *дзеканне*.

*Літ.*: Мартынов В.В. Славянская и индоевропейская аккомодация. Мн., 1968.

*В.У.Мартынаў.*

**АКАМАДА́ЦЫЯ** ў біялогіі і медыцыне, тэрмін, блізкі да *адаптацыі*. А. вока — прыстасаванне яго да выразнага бачання прадметаў, што знаходзяцца на рознай адлегласці; А. фізіялагічная ўзбудлівых тканак (мышачнай і нервовай) — прыстасаванне да дзеяння раздражняльніка, якое павольна нарастае па сіле; А. гісталагічная тканак — змена формы і суадносін тканкавых элементаў (клетак) у працэсе прыстасавання да зменлівых умоў.

**АКАМКАВА́ННЕ**, гл. *Акатванне*.

**АКАМПАНЕМЕ́НТ** (франц. accompagnement), музычнае суправаджэнне. 1) Партыі аднаго ці некалькіх інструментаў або пеўчых галасоў у ансамблі, падпарадкаваныя гал., сольнай партыі. 2) Кампанент муз. тканіны, які выконвае функцыю суправаджэння (інтанацыйна-меладычнага, рытмічнага, гарманічнага). Адрозніваюць монафанічны і поліфанічны (гарманічны) А., якія ў працэсе развіцця муз. творчасці набылі разнастайныя формы. 3) Выкананне муз. суправаджэння.

*І.Дз.Назіна.*

**АКАМЯНЕ́ЛАСЦІ**, фасіліі, рэшткі і сляды жыццядзейнасці арганізмаў мінулых геал. эпох, якія захаваліся ў асадкавых пародах. Падзяляюцца на рэшткі арганізмаў, *адбіткі* і злепкі, сляды і прадукты жыццядзейнасці (гл. *Капраліты*). Утвараюцца пасля пахавання арганізмаў у выніку *фасілізацыі*. Ад раслін у горных пародах захавалася разрозненае лісце, абрыўкі галін, абломкі ствалоў, шышкі, плады, насенне, споры, пылок, зрэдку — кветкі. Добра захаваліся жывёлы або іх рэшткі ў вечнай мерзлаце (маманты, рыбы і інш.), азакерыце. Захаванасць рэшткаў залежыць ад будовы арганізма і ўмоў яго пахавання. Даследаванне А. дае магчымасць вызначаць адносны ўзрост асадкавых тоўшчаў зямной кары, уявіць звенні ланцуга эвалюцыі жывых арганізмаў у геал. мінулым Зямлі. Утварэнне А. вывучае *тафаномія*. Узоры А. зберагаюцца ў палеанталагічных музеях.

**АКА́Н**, група народаў (ашанты, фанты, акім, аквапім, аны, бауле, гонджа, крачы, абронг і інш.) у Гане (больш за 7,7 млн. чал.), Кот-д'Івуар (2,3 млн. чал.) і Тога (50 тыс. чал., 1987). Мовы групы акан.

**АКАНІ́Т**, гл. *Боцікі*.

**АКАНІ́ЦА**, канструкцыйна-дэкаратыўны элемент афармлення аконнага праёма (гл. *Акно*). Узнікла ў стараж.-рус. архітэктуры ў выглядзе засавак (дошак

Аканіцы жылога дома ў вёсцы Моцеўкі Міёрскага раёна Віцебскай вобл.

на палазах), якімі зачынялі незашклёныя валаковыя вокны курных хат. У сял. буд-ве бытавала да канца 19 ст. З развіццём вял. акон, аздобленых *ліштвамі*, паявіліся А. на «бегунах», або «пятках» (спец. шыпах, на якіх паварочваліся), з 16 ст. — на метал. завесах у замкавым, сядзібным і гар. жыллёвым буд-ве. У сучаснай нар. архітэктуры А. аздабляюцца філёнгамі, дэкар. ўстаўкамі, разьбой.

**АКАНКА́ГУА** (Aconcagua), найбольшая вяршыня ў Андах і Паўд. Амерыцы, у Аргенціне, каля граніцы з Чылі. Выш. 6960 м. Складзена з андэзітаў, укрыта вечнымі снягамі, 7 ледавікоў. Агульная пл. абледзянення 80 км².

**А́КАННЕ**, вымаўленне не пад націскам гука «а» заўсёды або ў пэўным становішчы ў адпаведнасці з галоснымі «а», «о», «е» пад націскам. Характэрная асаблівасць бел. літ. мовы (перадаецца і на пісьме) і мясц. гаворак асн. масіву, за выключэннем усх.-палескай (мазырскай) групы, а таксама рус. літ. мовы і яе паўд. гаворак. Адрозніваюць А. пасля цвёрдых і А. пасля мяккіх (*яканне*) зычных. У бел. мове пашырана недысімілятыўнае (моцнае) і дысімілятыўнае А. Пры недысімілятыўным гук «а» выступае заўсёды ў 1-м складзе перад націскам, а таксама пераважна і ў інш. ненаціскных складах: «вада́», «чалаве́к», «гаварыў», «го́рад». Гэтае А. ўласціва гаворкам сярэднебел. групы, полацкамінскай падгрупы паўн.-ўсх. і паўд.-зах. дыялектам, дзе яно, аднак, няпоўнае, а таксама літ. мове. Пры дысімілятыўным А. ў 1-м складзе перад націскам гук «а» вымаўляецца, калі пад націскам выступае любы галосны, акрамя «а». Перад складам з націскам «а» пасля цвёрдых зычных утвараецца невыразны гук «ъ» або «ы». Падобныя гукі адзначаюцца і ў інш. ненаціскных складах, за выключэннем канцавога адкрытага складу: «вады́», «трава́й», але «гръва́», «бърьда́» (аднак «мно́га», «го́ра»). Такое А. ў гаворках магілёўска-віцебскай падгрупы паўн.-ўсх. дыялекту.

*Літ.*: Крывіцкі А.А., Падлужны А.І. Фанетыка беларускай мовы. Мн., 1984.

*А.А.Крывіцкі.*

**АКАНО́М**, кіраўнік панскай гаспадаркі, наглядчык за працай у фальварку на Беларусі ў перыяд феадалізму і капіталізму. Тэрмін вядомы з канца 16 ст. А. нёс адказнасць за гасп. дзейнасць у маёнтку, трымаў пад кантролем суд над сялянамі, кіраваў зборам падаткаў. На А. ўскладаўся абавязак кантролю за падуладнымі яму намеснікамі асобных фальваркаў. Ён вёў таксама ўсю гасп. справаздачу, якую прад'яўляў на рэвізію гаспадару ці яго адміністратару. Пасаду А. ў большасці выпадкаў займалі прадстаўнікі шляхецкага саслоўя.

*У.І.Пашкевіч.*

**АКА́НТ** у архітэктуры, арнаментальна-дэкаратыўны элемент аздаблення фасадаў і інтэр'ераў будынкаў і збудаванняў у выглядзе аканта (расліна, пашыраная ў Міжземнамор'і). Вядомы з антычнасці. Характэрны для зах.-еўрап., у т.л. беларускай, архітэктуры рэнесансу, барока, класіцызму. Арнамент з асобных зубчастых лістоў А. аздабляў кансолі і дэнтыкулы, з сабраных у пучок у форме чашы — карынфскія і кампазітныя капітэлі; бягучы бесперапынны арнамент з А. выкарыстоўваўся ў фрызах, спіралепадобны — у круглых разетках і медальёнах.

Аканіцы жылога дома ў вёсцы Старое Сяло Веткаўскага раёна Гомельскай вобл.

**АКАНТАЦЭФАЛЁЗЫ**, інвазійныя захворванні (гельмінтозы) жывёл, зрэдку чалавека, якія выклікаюцца калючагаловымі чарвямі — *скрэбнямі* (акантацэфаламі). Паразітуюць у кішэчніку свіней, сабак, лісоў, ваўкоў, барсукоў, качак, рыб, чалавека. На Беларусі найб. небяспечныя макракантарынхоз, палімарфоз, філікалёз, эхінарынхоз і памфарынхоз. Крыніца інвазіі — хворыя жывёлы, што заражаюцца А. пры паяданні прамежкавых гаспадароў (малюскаў, ракападобных, насякомых), у целе якіх знаходзяцца лічынкі скрэбняў (акантэлы).

**АКАНТАЦЭФА́ЛЫ**, гл. *Скрэбні*.

**АКАНТО́ДЫ** (Acanthodei), клас вымерлых рыб. Вядомы з адкладаў позняга сілуру — ранняй пермі Еўразіі, Паўн. Амерыкі, Аўстраліі, Антарктыды. 4 атрады. На Беларусі рэшткі А. (луска, шыпы) знойдзены ў адкладах ніжняга і сярэдняга дэвону. Жылі пераважна ў прэсных вадаёмах з імклівым цячэннем, радзей у лагунах і морах. У асноўным планктафагі. Магчыма, ад прымітыўных А. адасобіліся храстковыя і касцявыя рыбы.

Даўж. да 0,5 м. Цела верацёнападобнае, з дробнымі касцявымі пласцінамі на галаве, з шыпамі (іхтыядаруліты) перад усімі плаўнікамі, акрамя хваставога. Луска ганоіднага тыпу.

**АКАНТЫ́Т** (ад грэч. akantha калючка, іголка), мінерал класа сульфідаў, сульфід серабра з групы *аргентыту*. Мае 87% серабра з прымесямі медзі, жалеза, цынку і інш. Утварае плёнкі, зямлістыя агрэгаты («сярэбраная чэрнь»), суцэльныя масы, дробныя крышталі і г.д. Колер жалезіста-чорны. Бляск металічны. Цв. 2—2,5; коўкі. Шчыльн. 7,2—7,3 г/см$^3$. Гідратэрмальны мінерал (у свінцова-цынкавых радовішчах з аргентытам). Радовішчы ў Чэхіі, Германіі, ЗША. Каштоўная *сярэбраная руда*.

**АКА́ПІ** (Okapia johnstoni), парнакапытнае млекакормячае сям. жырафаў. Жыве ў Афрыцы ў вільготных трапічных лясах бас. р. Конга. Рэдкая жывёліна.

Даўж. цела каля 2 м, выш. ў карку да 1,2 м, маса каля 250 кг. Афарбоўка карычняватая са светлымі папярочнымі палосамі на нагах. Морда выцягнутая, вушы вялікія, у самца 2 невял. рагі, рагавыя чахлы на канцах рагоў штогод зменьваюцца. Корміцца лісцем. Цяжарнасць 14—15, лактацыя 6 месяцаў. Трымаюць у заапарках, дзе паспяхова размнажаецца.

**А КАПЭ́ЛА** (італьян. a cappella), шматгалосыя харавыя спевы без інстр. суправаджэння. Пашыраны ў нар. творчасці. Як стыль прафес. хар. мастацтва склаліся ў культавай поліфаніі ў канцы сярэднявечча, дасягнулі росквіту ў майстроў *Нідэрландскай школы* і Дж.*Палестрыны*. Для правасл. царквы спевы А к. — адзіная форма хар. мастацтва. З эпохі Адраджэння развіваюцца і ў свецкай музыцы. На Беларусі ранні свецкі жанр спеваў А к. — *кант*. У стылі А к. працавалі кампазітары розных эпох. Сярод бел. — В.Залатароў, М.Равенскі, А.Багатыроў, Р.Пукст, У.Алоўнікаў, Ю.Семяняка, Э.Тырманд, А.Мдывані, Л.Захлеўны, А.Бандарэнка і інш.

*А.А.Саламаха.*

**АКАПІ́Н** Акоп (29.5.1866, г. Гянджа — 13.11.1937), армянскі паэт. Нар. паэт Арменіі і нар. паэт Грузіі (1923). З гімназіі выключаны за вальнадумства. Удзельнік рэв. руху ў Закаўказзі, неаднойчы быў арыштаваны. Заснавальнік армянскай пралетарскай паэзіі. Першы зб. «Вершы» (1899). Паэмы «Новы ранак» (1909), «Чырвоныя хвалі» (1911) прысвечаны рэв. руху ў Закаўказзі. Асн. матыў паэзіі 1920—30-х г. — рамантыка сацыяліст. буд-ва (паэмы «Багі загаварылі», 1922; «Шыр-канал», 1924; «Волхаўбуд», 1925; «Горад», 1931).

Матыў **аканта** ў аздабленні інтэр'ера касцёла ў в. Міхалішкі Астравецкага раёна Гродзенскай вобл.

Акапі.

*Літ.*: Манукян С. Акоп Акопян: Критико-биогр. очерк: Пер. с арм. М., 1980.

**АКАРАЛО́ГІЯ** (ад грэч. akarі клешч + *...логія*), галіна *арахналогіі*, навука пра *кляшчоў*. Мае прыкладныя раздзелы — мед., вет., с.-г. А. Навук. А. сфарміравалася ў 18 ст. (швед. вучоны К.Ліней). На Беларусі н.-д. работа вядзецца з 1920-х г. (М.М.Судзілоўскі, І.В.Шчарбінін, В.Л.Якімаў, К.Ф.Расцягаева, І.Ц.Арзамасаў, Б.П.Савіцкі, В.І.Вацякоў, Н.П.Мішаева, І.В.Чыкілеўская і інш.). Вывучаюцца біялогія кляшчоў і іх роля ў фарміраванні эпідэміял. сітуацый; даследуюцца кляшчы — узбуджальнікі хвароб чалавека, жывёл і раслін (іксодавыя, гамазавыя, чырвана-

Узбуджальнік **акантацэфалёзаў** Polymorphus magnus (самец).

цельцавыя, панцырныя, акароідныя, раслінаедныя і інш.). Вывучаюцца асаблівасці змен акаракомплексаў у залежнасці ад ландшафтнага размеркавання з мэтай прагназіравання ачагоў масавага размнажэння кляшчоў у асн. лесараслінных зонах.

**АКАРАПІДО́З** пчол, акароз, акарыёз, кляшчовая хвароба, небяспечная хранічная інвазійная хвароба рабочых пчол, матак і трутняў, якая выклікаецца паразітаваннем кляшча Acarapis Woodi. Пашырана ў краінах Еўропы. Да А. ўспрыімлівыя ўсе пароды. Кляшчы адкладваюць яйцы ў

трахеі, і на 3—6-ы дзень утвараюцца лічынкі. Цыкл развіцця 10—16 сут. На адной пчале можа паразітаваць да 150 кляшчоў. З моманту заражэння адзінкавых пчол да пашкоджання 50% сям'і праходзіць 3—5 гадоў. Ранняй вясной хворыя пчолы не могуць узняцца ў паветра, падаюць на зямлю, сядзяць кучкамі.

**АКАРДЭО́Н** (франц. accordéon), музычны інструмент класа ідыяфонаў віду язычкова-духавых; разнавіднасць ручнога храматычнага *гармоніка*. Мае правую клавішную і левую кнопкавую клавіятуры, над якімі размешчаны рэгістры-пераключальнікі для змены афарбоўкі і сілы гуку. Створаны ў 1829 венскім майстрам К.Даміянам, хутка пашырыўся ў многіх краінах. На Беларусі з'явіўся ў пач. 20 ст. Выкарыстоўваецца ў нар. побыце пераважна для суправаджэння танцаў, у выканальніцкай самадзейнай і прафес. практыцы. Ігры на А. навучаюць у муз. установах рознага ўзроўню. *І.Дз.Назіна.*

**АКАРКАВЕ́ННЕ**, працэс адкладання тлушчападобнага рэчыва суберыну ў абалонках клетак шматгадовых раслін. Характэрна для клетак покрыўных тканак — экзадэрмы і корку, якія ахоўваюць унутр. тканкі кораня і сцябла ад страты вільгаці і ваганняў т-ры. Корак не дае раслінам высыхаць і ахоўвае жывыя клеткі, спрыяе загойванню ран.

**АКАРО́З**, тое, што *акарапідоз*.

**АКА́РЫДЫ**, гл. ў арт. *Кароставыя кляшчы*.

**АКАРЫЁЗ**, тое, што *акарапідоз*.

**АКАРЫ́НА** (італьян. ocarina літар. гусяня), музычны інструмент класа аэрафонаў віду глабулярных флейтаў. Мае гліняны корпус авальнай формы, свісткovае прыстасаванне, 8—10 ігравых адтулін. Створана ў 1860 італьян. майстрам Дж.Данацы, хутка пашырылася ў краінах Еўропы, у т.л. на Беларусі (нар. назвы «карына», «конік»). У адпаведнасці з бел. традыцыяй набыла цыліндрычную форму. Вырабляецца найчасцей уручную, пакрываецца палівай.

Выкарыстоўваецца пастухамі для ігры сола, музыкантамі-аматарамі для суправаджэння спеваў. *І.Дз.Назіна.*

**АКАРЫФО́РМНЫЯ КЛЯШЧЫ́** (Acariformes), атрад членістаногіх кл. павукападобных. Больш за 6 тыс. відаў з 200 сямействаў. На Беларусі спецыяльна не вывучаліся; найб. пашыраны А.к. з 2 падатрадаў: саркаптыформных (акароідныя кляшчы, *кароставыя кляшчы*, *панцырныя кляшчы*, *пер'евыя кляшчы*, валасяныя) і трамбідыформных (*галавыя кляшчы*, *чырванацельцавыя кляшчы*, вадзяныя, павуцінныя). Жывуць на глебе, у глебе, вадзе.

Даўж. цела 0,2—0,8 мм. Цела падзелена на галаву і тулава. Ротавы апарат утвораны 2 парамі пярэдніх ног. 4 пары ног, кожная з 5—6 членікаў. У развіцці праходзяць фазы лічынкі, німфы (3) і дарослай асобіны. Кладуць яйцы. Сапрафагі і фітафагі. Многія — шкоднікі раслін і с.-г. прадуктаў, паразіты жывёл і чалавека.

**АКАРЫЦЫ́ДЫ** [ад грэч. akarі клешч + *...цыд*(ы)], *пестыцыды*, прызначаныя для барацьбы з *кляшчамі*. Існуюць А. раслiннага (анабазін, нікацін) і сінтэтычнага (фосфарарган., хлараваныя арган. злучэнні, карбаматы і інш.) паходжання. Выкарыстоўваюць у выглядзе водных растворaў, эмульсій, суспензій, дустаў, газаў, аэразоляў. Магчыма атрутнае ўздзеянне на чалавека, жывёл і птушак. З А. найб. шырока ўжываюцца мінер. масла, сера, вапнава-серны адвар, фосфарарган. злучэнні (хларафос, карбафос). Парушэнні тэхналогіі выкарыстання А. вядуць да экалагічных страт.

**АКА́СІ**, горад у Японіі, на ПдЗ в-ва Хонсю, у прэфектуры Хіёга. 263 тыс. ж.



Акардэон.



Акарыны.

Да арт. Акацыя. Кветучая галінка мімозы.

(1987). Рыбалоўны порт на Унутраным Японскім м. Харч., баваўняная прамысловасць, цяжкае і с.-г. машынабудаванне (аўтазавод), хім. прадпрыемствы, марскі курорт.

**АКАСМІ́ЗМ** (ад *а*... + грэч. kosmos Сусвет), філасофскае і рэлігійнае вучэнне, якое прапаведуе погляды аб нікчэмнасці свету. У найб. чыстым выглядзе сустракаецца ў класічнай інд. філасофіі (гл. *Веданта*), пашырана і ў хрысціянстве. Гегель называў А. пантэізм Спінозы, паколькі бог у ім ёсць адзіная вечная і бясконцая субстанцыя, усё астатняе — часовае, неістотнае. А. наз. таксама *спірытуалізм*, які адмаўляе рэальнасць навакольнага свету.

**АКА́ТВАННЕ**, акамкаванне, метад атрымання камякоў пылападобнай руды, мінер. угнаенняў ці танказдробненых канцэнтратаў, спяканне якіх ускладнена. Увільготнены матэрыял у вярчальным барабане ці талерчатым гранулятары ператвараецца ў камякі, трываласць якім надаецца хім. спосабам, абпальваннем ці высушваннем. Канчатковы прадукт наз. *акатышам*. У каляровай металургіі акатваюцца свінцовыя, медныя, нікелевыя канцэнтраты, для жал. рудаў акрамя А. выкарыстоўваюць *агламерацыю*.

**АКАТУ́ЙСКАЯ ТУРМА́**, катаржная турма ў Рас. імперыі; адзін з цэнтраў паліт. катаргі, дзе трымалі рэвалюцыянераў-народнікаў, а пасля рэв. 1905—07 паліт. вязняў з рабочых, сялян, салдат. Пабудавана ў 1888 у Нерчынскай горнай акрузе Забайкалля (цяпер тэр. Чыцінскай вобл.). Ліквідавана пасля Лют. рэв. 1917.

**АКА́ТЫШЫ**, трывалыя, аднароднага саставу і аднолькавага памеру абпаленыя шарыкі з дробнай пылападобнай жал. руды ці танказдробненага канцэнтрату. Атрымліваюць пры *акатванні*. Бываюць неафлюсаваныя і афлюсаваныя (з дабаўкай *флюсу*). Жалезарудныя А. змяшчаюць 57—69% жалеза ў форме аксідаў, выкарыстоўваюцца ў доменнай выт-сці; металізаваныя (30—95% адноўленага жалеза) у выт-сці якаснай сталі.

**АКА́ФІСТ** (грэч. akathistos ад *а*... + kathizō саджуся), хрысціянскае хвалебнае царк. песнапенне. Выконваецца абавязко́ва стоячы. Кожны А. складаецца з 25 асобных песнапенняў. Найб. вядомыя і стараж. А.: Божай Маці (7 ст.) і Ісусу Найсаладзейшаму (9 ст.), свяціцелю Мікалаю Цудатворцу (14 ст.). Створаны таксама А. святым, абразам, царк. святам. Кніга, дзе сабраны ўсе А., наз. акафіснік. Першы на Беларусі акафіснік выдадзены Ф.Скарынай у 1525. Шматтомны акафіснік з 1991 друкуецца ў Маскве (ім карыстаюцца і праваслаўныя на Беларусі). *Г.М.Шэйкін.*

**АКА́ЦЫЯ** (Acacia), род раслін сям. бабовых. 750—800 відаў, пашыраны ў тропіках і субтропіках абодвух паўшар'яў, большасць расце ў Аўстраліі (выява

А. — нац. эмблема), дзе яны, як і ў Афрыцы, істотны элемент саванны. У бат. садах і парках Чарнаморскага ўзбярэжжа Каўказа ў 19 ст. акліматызавана каля 10 відаў. Найб. вядомыя: А. серабрыстая (A. dealbata), якую вырошчваюць як дэкар. расліну (т. зв. *мімоза*); А. белая, або псеўдаакацыя (Robinia pseudoacacia) з роду *рабінія*; А. жоўтая, або караганнік дрэвападобны (Caragana arborescens) з роду *карагана*. На Беларусі як дэкар. расліны вырошчваюць апошнія 2 віды.

Пераважна вечназялёныя дрэвы, кусты, зрэдку травы. Кветкі жоўтыя або белыя, дробныя. Плод — боб. З шэрагу відаў атрымліваюць дубільныя рэчывы і гуміарабік.

**АКАЯ́МА**, горад у Японіі, на ПдЗ в-ва Хонсю. Адм. ц. прэфектуры Акаяма. 583 тыс. ж. (1987). Гандл.-размеркавальны і культ. цэнтр зах. Японіі. Тэкст., маш.-буд. (эл.-машынабудаванне, суднабудаванне), хім., папяровая, харч., ганчарна-керамічная прам-сць. Саматужная вытв-сць фарфору і цыновак татамі. Аванпорт А. — Уна; чыг. паром да в-ва Сікоку. Ун-т. Парк Каракуэн (1786).

**АКБА́Р** Джэлаль-ад-дзін (1542—1605), правіцель *Магольскай імперыі* ў Індыі [1556—1605]. Пры ім дзяржава *Вялікіх Маголаў* дасягнула найб. магутнасці. Значна пашырыў яе межы, заваяваўшы тэр. ад Балха на Пн да р. Гадавары на Пд (у т.л. *Кашмір* і тэр. сучаснага Афганістана) і ад мора на З да мора на У. Вёў барацьбу з сепаратызмам феадалаў, у 1574 імкнуўся ліквідаваць сістэму *джагіраў*, што выклікала супраціўленне мусульм. джагірдараў. Упершыню стаў прызначаць індусаў на важныя дзярж. пасты, дынастычнымі шлюбамі ўмацаваў сувязі з раджпуцкімі княствамі, конніца раджпутаў стала асновай арміі. Увёў новую рэлігію «дзін-і ілахі» («божая вера») з элементамі ісламу, індуізму, парсізму і джайнізму.

**АКВА...** (ад лац. aqua вада), першая састаўная частка складаных слоў, якая па значэнні адпавядае слову «водны», напр., *акваплан, акваторыя*.

**АКВАДА́Г**, калоідна-графітавы прэпарат для ўтварэння электраправодных пакрыццяў на ўнутр. і вонкавай паверхнях *электравакуумных прылад*. Для ўнутр. пакрыццяў выкарыстоўваюць водную суспензію танказдробненага графіту, для вонкавых — сумесь графітавага парашку з арган. лакамі. Можа выконваць ролю электродаў, служыць для адводу эл. зарадаў з унутр. паверхні абалонкі прылады, аховы яе ад дзеяння вонкавых эл. палёў і забеспячэння эл. кантактаў паміж асобнымі вузламі электравакуумных прылад.

**АКВАКУЛЬТУ́РА**, развядзенне і таварнае вырошчванне каштоўных водных арганізмаў (рыб, ракападобных, малюскаў, водарасцяў). Адрозніваюць А. прэснаводную і марскую (марыкультуру). Вылучаюць 2 кірункі развіцця А.: вырошчванне каштоўных відаў рыб і беспазваночных з выкарыстаннем штучных кармоў і пашавае — на натуральнай кармавой базе ў паўканталюемых умовах. У прэснаводнай А. выкарыстоўваюць штучныя і натуральныя вадаёмы, а таксама індустр. ўстаноўкі, у марыкультуры — прыбярэжную зону мораў. Існуе ў краінах з высокім тэхн. узроўнем рыбалоўства (Японія, Вялікабрытанія, Нарвегія) і краінах паўд.-азіяцкага і афр. рэгіёнаў. Сусветны прадукт А. складае 9,4—9,5 млн. т (на марыкультуру прыпадае каля $^2/_3$; 1983—87).

На Беларусі А. існуе ў выглядзе сажалкавага і азёрнага *рыбаводства*, развіваюцца індустр. формы рыбаводства на прамысл. прадпрыемствах. Функцыянуюць 21 сажалкавы, 6 азёрных рыбгасаў, 8 рыбагадавалынікаў; вырошчваюць карпа, сазана, карася сярэбранага, амура белага, таўсталобіка, стронгу радужную. Сяэднегадавы аб'ём сажалкавай рыбы складаў каля 18 тыс. т у 1986—90, 6 тыс. т у 1994, у азёрных гаспадарках 0,7 тыс. т, у індустр. рыбаводстве 1,4 тыс. т (1990).

Акбар са сваім сынам Джахангірам і ўнукам Шахам-Джаханам. Мініяцюра. Каля 1630.

**АКВАЛА́НГ** (ад *аква*... + англ. lung лёгкае), аўтаномны апарат, з дапамогай якога чалавек дыхае пад вадой. Вынайдзены французамі Ж.І.Кусто і Э.Ганьянам (1943). Складаецца з балонаў са сціснутым паветрам (да 200 *ат*), аўтамата, што рэгулюе выдыханне і паступленне паветра адпаведна ціску навакольнага асяроддзя і інш. элементаў. У комплексе з маскай, гідракамбінезонам, ластамі і інш. выкарыстоўваецца ў падводным спорце і паляванні, у даследаваннях, выратавальнай службе.

Аквамарын.

**АКВАЛЬНЫ ЛАНДША́ФТ**, аквакомплекс, прыродная адзінка дзялення воднага асяроддзя (акіяна, возера, вадасховішча); участак, якому ўласцівы спецыфічныя асаблівасці характарыстык вады, газавага саставу, донных адкладаў і *біёты*. Аналагічны *ландшафту геаграфічнаму* на сушы.

**АКВАМАРЫ́Н** (ад лац. aqua marina марская вада), мінерал, разнавіднасць *берылу*. Празрыстыя крышталі сіняваталяблёнага ці блакітнага колеру. Трапляюцца ў гранітных і слюдзяна-кварцавых горных пародах (Бразілія, ЗША, Мадагаскар, Індыя, Украіна). Каштоўны камень.

Акваланг: 1 — маска з загубнікам; 2 — дыхальны апарат; 3 — балоны са сціснутым паветрам; 4 — рамяні мацавання.

**АКВАНА́ЎТ**, гл. *Гідранаўт*.

**АКВАНІ́ТЫ**, воданапоўненыя пластычныя выбуховыя рэчывы на аснове аміячнай *салетры* і *тратылу*. Цеплата выбуху каля 4,6 МДж/кг. Малаадчувальныя да мех. ўздзеяння. Выкарыстоўваюць у шахтах і рудніках, бяспечных па газе і пыле.

**АКВАПЛА́Н** (ад *аква*... + *план*), драўляны плоцік, які буксіруецца самаход-

ными суднамі і прызначаны для міжсезоннай трэніроўкі спартсменаў (у т.л. гарналыжнікаў). Даўж. каля 0,9 м, шыр. 0,6 м; аптымальная скорасць буксіравання 30—45 км/гадз, даўж. буксірнага шнура 10—15 м.

**АКВА́РЫУМ** (ад лац. aquarium вадаём), 1) пасудзіна, у якой трымаюць і развodзяць *акварыумных рыб*, водных жывёл і расліны. Бываюць рознай канструкцыі, формы і памераў (суцэльна шкляныя або з метал. каркасам і шклянымі сценкамі, часам з арганічнага шкла; сферычныя, прамавугольныя, са скошанай пярэдняй сценкай, якія звычайна падвешваюць на сцяне, і інш.). Мая адпаведны аб'ём (у залежнасці ад відаў і памераў жывёл) і ўмовы існавання (грунт, расліны, святло- і цеплярэгулявальная апаратура, аэратары і інш.). У якасці грунту выкарыстоўваюць прамыты рачны пясок. У А. трымаюць расліны, якія плаваюць на паверхні ці ў тоўшчы вады, і тыя, што ўкараняюцца ў грунце (вядома каля 70 відаў, у т.л. *сальвінія*, *эладэя*, вадзяная салата, валіснерыя, крыптакарына і інш.). З мясцовай флоры Беларусі могуць быць выкарыстаны *харавыя водарасці*, *раскі*, *рагаліснік*, *стрэлкаліст*, *балотнікі*, палушнік азёрны, рычыя плаваючая і інш. *водныя расліны*. 2) Спец. навук. ўстанова, якая вывучае і дэманструе прадстаўнікоў марской і прэснаводнай фауны і флоры. Існуюць у многіх краінах свету. Буйныя А. ў заапарках Масквы, Таліна, Ташкента, Рыгі. А. для марскіх жывёл звычайна размяшчаюць на беразе мора (першыя створаны ў Севастопалі ў 1871, у Неапалі ў 1872), некаторыя з іх наз. *акіянарыум*.

**Акваплан** (частковы разрэз; памеры ў мм).

**Акварыумныя рыбы**: 1 — гурамі жамчужны; 2 — малінезія; 3 — скалярыя; 4 — неон блакітны; 5 — даніо рэрыо; 6 — гупі; 7 — мечаносец; 8 — барбус суматранскі; 9 — хаплахроміс Буртані; 10 — сомік Графа; 11 — залатая рыбка (Аранда).




**Тыпы акварыумаў**: 1 — трохвугольны; 2 — шарападобны; 3 — прамавугольны каркасны; 4 — цыліндрычны; 5 — убудаваны ў мэблю; 6 — насценны.

**АКВА́РЫУМНЫЯ РЫ́БЫ**, рыбы, якіх вырошчваюць і разводзяць у *акварыумах* з дэкар. і навук. мэтамі. З некалькіх сотняў відаў на Беларусі пашыраны каля 40. Найб. вядомыя: *залатая рыбка*, мечаносцы, гупі, даніо, скалярыі, неоны, барбусы, сомікі, хромісы, наноста-

мусы, хеміграмусы, дыскусы, цыхлазомы, гурамі, грымі, малінезіі, тэрнецыі.

**АКВАРЭ́ЛЬ** (франц. aquarelle ад лац. aqua вада), фарбы, разведзеныя на вадзе (звычайна з раслінным клеем) і прызначаныя для жывапісу, а таксама від жывапісу, твор, выкананы ў тэхніцы А. гэтымі фарбамі. Асн. якасці А. — празрыстасць, чысціня і яснасць колеру. А. спалучае асаблівасці жывапісу і графікі. Спецыфічныя прыёмы — размывы і зацёкі, якія ствараюць эфект рухомасці і трапятлівасці.

А. (з дамешкам бяліл, гл. *Гуаш*) была вядомая ў Стараж. Егіпце, Кітаі, Японіі. У 15—17 ст. служыла пераважна для расфарбоўкі гравюр, чарцяжоў, эскізаў карцін і фрэсак, выкарыстоўвалася і самастойна (пейзажы А.Дзюрэра, галандскіх і фламандскіх мастакоў). З 18 ст. пашырылася ў пейзажным жывапісе. З'явіліся прафес. мастакі-акварэлісты. У 19 ст. распаўсюдзілася ў Англіі (У.Тэрнер, Р.Бонінгтан), Францыі (Э.Дэлакруа, А.Дам'е), Расіі (К.Брулоў, А.Іваноў, У.Бяхцееў, А.Астравумава-Лебедзева, А.Фанвізін, М.Урубель).

На Беларусі выкарыстоўвалася ў 15 ст. ў мініяцюрах Радзівілаўскага летапісу, у 17—18 ст. — для расфарбоўкі гравюр. У 19 — пач. 20 ст. жанравыя карціны і пейзажы ў тэхніцы А. ствараліЛ.Альпяровіч, С.Богуш-Сестранцэвіч, Я.Дамель, К.Кастравіцкі, М.Кулеша, Н.Орда, І.Пешка, Ф.Рушчыц; у 1920—30-я г. — А.Астаповіч, В.Волкаў, У.Кудрэвіч, М.Лебедзева, М.Філіповіч. Пазней традыцыйная А. атрымала развіццё ў творчасці Л.Лейтмана, А.Волкава, В.Цвіркі, І.Сталярова. Новы этап развіцця А. азначыўся на пач. 1960-х г. Арганізуюцца ўсесаюзныя (1965) і рэсп. (1966) выстаўкі, ствараюцца групы мастакоў акварэлі, фарміруюцца школы акварэлі (гл. *Віцебская школа акварэлі*). Пашырэнне выяўл. сродкаў, тэхн. прыёмаў, мастацкіх манер прывяло да вызначэння спецыфікі акварэльнага вобраза. А. зацвердзілася як самастойны від жывапісу. Шырокую вядомасць атрымалі творы А.Паслядовіч, У.Сталмашонка, З.Літвінавай, П.Драчова, Г.Шутава, Ф.Гумена, І.Пратасені, Г.Паплаўскага, Ф.Кісялёва, В.Паўлаўца, Л.Марчанкі.

*Літ.:* Беспалый А. Беларуская акварэль. Мн., 1989. *У.І.Рынкевіч.*

**АКВАТО́ЛЫ**, воданапоўненыя выбуховыя рэчывы брызантнага дзеяння. Маюць цягучую або гелепадобную кансістэнцыю, складаюцца з нітрату амонію, трынітраталуолу, гаручых дабавак; асн. ўласцівасцямі блізкія да *акванітаў*. Выкарыстоўваюцца для разбурэння воданапоўненых моцных горных парод пры раскрыўных работах.

**АКВАТО́РЫЯ** [ад *аква...* + (тэры)торыя], участак прасторы мора, возера, ракі ў натуральных, штучных або ўмоўных межах; звычайна водная частка марскога порта — *гавань*. А. порта ўключае водныя падыходы, рэйд, унутр. гавань або басейны з прычальнымі збудаваннямі, дзе адбываецца разгрузка і пагрузка суднаў. Бываюць А. гідрааэрадромаў, марскіх палігонаў.

**АКВАТЫ́НТА** (італьян. acquatinta), тэхнічная разнавіднасць *гравюры*, у якой метал. дошка пратраўліваецца праз прыліпшы да яе асфальтавы або каніфольны пыл. У А. дасягаюцца маляўнічыя эфекты, блізкія да тонавага малюнку. Выкарыстоўваецца ў спалучэнні са штрыхаваным афортам, узбагачаючы яго танальнымі і фактурнымі адценнямі. У бел. мастацтве выкарыстоўваецца з 17 ст. (асобныя творы Л. і А.Тарасевічаў). У 19 ст. значна пацеснена *літаграфіяй*.

**АКВЕДУ́К** (ад *аква...* + лац. duco вяду), вадавод (канал, труба) для падачы вады ў населеныя пункты, арашальныя і

Да арт. **Акварэль.** М.Урубель. Партрэт Т.С.Любатовіч у ролі Кармэн. 1890-я г.

Да арт. **Акварэль.** Л.Марчанка. Без. 1994.

Да арт. **Акварэль.** І.Пратасеня. Набат 1863. К.Каліноўскі і Марыся. 1990.

Да арт. **Акварэль.** Г.Паплаўскі. Буслы Браслаўшчыны. 1994.

Да арт. **Акварэль.** В.Паўлавец. Стажкі. 1991.

Да арт. **Акварэль.** Э.Дэлакруа. Стрэл (фантазія). 1832.

гідраэнергет. сістэмы з размешчаных вышэй за іх крыніц. А. наз. таксама частку вадавода ў выглядзе моста над ракой, дарогай, ярам. А. вядомы з 2-га тыс. да н.э. ў краінах Стараж. Усходу, Стараж. Грэцыі (з 7 ст. да н.э.) і Стараж. Рыма (з 4 ст. да н.э.). У сучасных арашальных і гідраэнергет. сістэмах маставыя часткі А. робяць з бетону, жалезабетону, металу, каменю ці дрэва. Найб. пашыраны А., у якіх сценкі латка ці трубы — нясучыя пралётныя канструкцыі моста.

**АКВІЗІ́ЦЫЯ**, 1) залучэнне новых кліентаў, грузаў, страхаванняў агентам транспартных або страхавых кампаній — аквізітарам. 2) А. на біржы — скупка акцыянерам (групай акцыянераў) усіх акцый прадпрыемства, што азначае куплю гэтага прадпрыемства. Набыццё адным прадпрыемствам другога ці зліццё без згоды прадпрыемства, якое траціць сваю самастойнасць, называюць «варожай» А.

**АКВІЛЕ́ГІЯ**, гл. *Ворлікі*.

**АКВІ́НК** (Aquincum), горад рымскіх часоў (каля 10 да н.э. — 409 н.э.), з 107 н.э. — гал. горад рым. правінцыі Ніжняя Панонія. Руіны А. знаходзяцца каля Будапешта. Раскопкі вядуцца з 1775. А. складаўся з паселішча мясц. племя эравіскаў, рым. ўмацаванага лагера, ваен. ці лагернага горада і цывільнага горада. У час раскопак выяўлены рамесныя кварталы, амфітэатр, абарончыя сцены, водаправод, палац намесніка Ніжняй Панноніі і інш.

**АКВІТА́НІЯ** (лац. Aquitania), гістарычная вобласць на ПдЗ Францыі. У старажытнасці рымская правінцыя ў Галіі. З 507 належала Франкскаму каралеўству, у 2-й пал. 7 — 1-й пал. 8 ст. — герцагства. У 1154—1453 англ. ўладанне. З 13 ст. мела назву Гіень. У 1472 канчаткова далучана да Францыі.

**АКВІТА́НСКАЯ НІЗІ́НА**, гл. *Гаронская нізіна*.

**АКЕА́НАЎ** Аляксей Яўтенавіч (н. 25.6.1949, г.Уладзікаўказ, Паўн. Асеція), вучоны-анколаг. Д-р мед. н. (1989). Скончыў Паўн.-Асецінскі мед. ін-т (1972). З 1972 у НДІ анкалогіі і мед. радыялогіі Мін-ва аховы здароўя Рэспублікі Беларусь. З 1992 дырэктар Бел. цэнтра мед. тэхналогій, інфарматыкі, кіравання і эканомікі аховы здароўя. Навук. працы па эпідэміялогіі рака і інш. інфекцыйных хвароб, арганізацыі аховы здароўя, інфарматыцы.

**АКЕ́ЕЎ** Таламуш (н. 11.9.1935), кіргізскі кінарэжысёр. Нар. арт. Кыргызстана (1975), нар. арт. СССР (1985). Скончыў Ленінградскі ін-т кінаінжынераў (1958). З 1964 рэжысёр на кінастудыі «Кіргізфільм». Найб. значныя работы: «Неба нашага дзяцінства» (1968), «Люты» (паводле аповесці М.Аўэзава «Шэры люты»), «Чырвоны яблык» (паводле Ч.Айтматава), «Нашчадак Белага Барса». Усе фільмы А. аб'ядноўвае трывалая сувязь з нац. культурай, сучаснае мысленне. Дзярж. прэмія Кыргызстана 1972.

**АКЕ́ЙДЫЯ** (Acadia), нацыянальны парк у ЗША, на астравах у Атлантычным ак., каля берагоў штата Мэн. Засн. ў 1916 пад назвай Сьёр-дэ-Мон (у 1919—29 наз. Лафеет) для захавання маляўнічага ўзбярэжжа, мяшаных лясоў на а-вах Маўнт-Дэзерт і Хо. Пл. 15,6 тыс. га. У флоры больш за 500 відаў вышэйшых раслін, шмат імхоў і лішайнікаў. У фауне — 50 відаў млекакормячых (у т.л. віргінскі алень), каля 300 відаў птушак.

**АКЕРМА́НСКАЯ КАНВЕ́НЦЫЯ 1826**. Падпісана паміж Расіяй і Турцыяй 7 кастр. ў г. Акерман (цяпер г. Белгарад-Днястроўскі, Украіна). Дапаўняла *Бухарэсцкі мірны дагавор 1812*, пашырыла ўплыў Расіі на Балканах. Турцыя прызнала размежавальную лінію на Дунаі, Расія атрымала права на свабоду гандлю на тэр. Турцыі і суднаходства ў яе водах, у *Дунайскіх княствах* аднаўлялася мясц. самакіраванне, вызначаліся прынцыпы будучага ладу Сербіі.

**АКІ́МАВА** Вольга Дзмітрыеўна (11.7.1883, Полацкі пав. Віцебскай губ. — 4.7.1969), бел. альголаг. Скончыла Вышэйшую школу, Вышэйшыя прыродазнаўчыя курсы ў Пецярбургу (1906—12). З 1920 у віцебскіх настаўніцкім і пед. ін-тах, БДУ. Адзін з першых даследчыкаў альгафлоры на Беларусі, вывучала яе відавы і колькасны склад, біямасу фітапланктону вадаёмаў Беларусі.

**АКІ́МАЎ** Барыс Барысавіч (н. 25.6.1946, Вена), рускі артыст балета. Засл. арт. Расіі (1976). Нар. арт. СССР (1989). Скончыў Маскоўскае харэагр. вучылішча (1965, педагог М.*Ліепа*), Дзярж. ін-т тэатр. мастацтва (1978). З 1905 у Вял. т-ры. Найб. блізкія А. партыі сучасных балетаў з вострай харэагр. лексікай: Іванушка («Канёк-Гарбунок» Ц.Пуні), Крас («Спартак» А.Хачатурана), Сяргей («Ангара» А.Эшпай, Дзярж. прэмія СССР 1977), Курбскі («Іван Грозны» С.Пракоф'ева). Лаўрэат Міжнар. конкурсу артыстаў балета ў Варне (1966).

**АКІ́МАЎ** Георгій Уладзіміравіч (23.4.1901, Масква — 23.1.1953), рускі фізікахімік. Чл.-кар. АН СССР (1939). Скончыў Маскоўскае вышэйшае тэхн. вучылішча (1926). Працаваў у авіяц. прам-сці (1927—47). З 1949 дырэктар Ін-та фіз. хіміі АН СССР. Распрацаваў тэорыю карозіі металаў (1933—38), класіфікацыю метадаў выпрабавання на карозію, стварыў тэхналогію атрымання гарачатрывалага сплаву для дэталяў авіяц. рухавікоў і шэраг марак нержавейнай сталі. Тры Дзярж. прэміі СССР.

*Тв.*: Основы учения о коррозии и защите металлов. М., 1946.

**АКІ́МАЎ** Іван Акімавіч (2.6.1754, С.-Пецярбург — 27.5.1814), рускі жывапісец, прадстаўнік класіцызму. Вучыўся ў Пецярбургскай АМ (1764—73) у А.П.*Ласенкі*. У 1779—1800 выкладчык, дырэктар Пецярбургскай АМ. Творы: «Вялікі князь Святаслаў, які цалуе маці і дзяцей сваіх пасля вяртання з Дуная ў Кіеў» (1773), «Геркулес на раздарожжы» (1801).

Акведук каля г. Нім. Францыя. 1—2 ст. н.э.

*Тв.*: Краткое историческое известие о некоторых Российских художниках // Северный вестн. 1804. Ч. 1. № 3.

**АКІ́МАЎ** Мікалай Паўлавіч (16.4.1901, Харкаў — 6.9.1968), рускі рэжысёр і мастак. Нар. арт. СССР (1960). Праф. (1960). Вучыўся ў Новай маст. студыі ў Петраградзе (1915—19). З 1922 тэатр. мастак, рэжысёр. У 1935—49 і з 1955 маст. кіраўнік Ленінградскага т-ра камедыі. Лепшыя спектаклі, якія паставіў і афарміў А., адметныя тонкай іроніяй, дакладнасцю характарыстык: «Звычайны цуд», «Дракон» Я.Шварца, «Дон Жуан» Дж.Байрана, «Стракатыя апавяданні» паводле А.Чэхава і інш. Аўтар графічных работ (кніжная ілюстрацыя, партрэт, тэатр. афіша).

**АКІ́МАЎСКІ ЗАВО́Д СЕЛЬСКАГАСПАДА́РЧАГА ІНВЕНТАРУ́**. Дзейнічаў з 1907 у маёнтку Акімаўскае Слуцкага пав. Выраблялі дробны с.-г. інвентар. У 1914 працавала больш за 50 рабочых. У 1921 рэарганізаваны ў с.-г. майстэрню.

**АКІ́НА** (Aquino) Карасон (н. 25.1.1933, прав. Тарлак, Філіпіны), дзярж., паліт. і грамадскі дзеяч Філіпін. Атрымала вышэйшую філал. і юрыд. адукацыю ў Нью-Йорку і Маніле. У 1980—83 у эміграцыі ў ЗША з мужам Б.Акіна, лідэрам апазіцыі рэжыму Ф.*Маркаса*. Пасля забойства мужа (1983) узначаліла апазіцыю. У лют. 1986—крас. 1992 прэзідэнт Філіпін. *А.А.Чалядзінскі.*

**АКІНА́ВА**, самы вялікі востраў архіпелага Рукю, у Японіі. Пл. 1254 км². Берагі моцна парэзаны, акаймаваны каралавымі рыфамі. На ПнУ і ў цэнтр. частцы А. нізкагор'і (выш. да 498 м), складзены пераважна са сланцаў, вапнякоў і пясчанікаў. Астатняя тэрыторыя — нізінная раўніна. Клімат трапічны, мусонны, ападкаў 1,3—2 тыс. мм за год, летам і восенню — тайфуны. На месцы вільготных трапічных лясоў зараснікі бамбуку, хмызнякоў, рысавыя палеткі, плантацыі ананасаў, цукр. трыснягу. Гал. горад — Наха. На А. размешчаны амерыканскія ваенныя базы.

**АКІНА́К** (грэч. akinakēs), кароткі (40—60 см) меч ці кінжал, традыцыйная зброя стараж. іранамоўных народаў (персаў, сакаў, саўраматаў, скіфаў). На Беларусі знойдзены 2 А. паблізу в. Асарэвічы Брагінскага р-на Гомельскай вобл.

**АКІНАСПЕРМІ́Я** (ад *а...* + грэч. kineō прыводзіць у рух + sperma семя), поўная нерухомасць жывых *сперматазоідаў* у сперме і няздольнасць іх да апладнення.

**АКІ́НЧЫЦ** Фабіян Іванавіч (20.1.1886, в. Акінчыцы, цяпер у межах г. Стоўбцы Мінскай вобл. — 7.3.1943), бел. грамадска-паліт. дзеяч. Скончыў Пецярбургскі ун-т (1913). У 1906—17 чл. партыі эсэраў. Пра яго жыццё і дзейнасць у 1917—23 звесткі супярэчлівыя. З 1923 на радзіме. З 1926 уваходзіў у кіруючыя органы Бел. сялянска-работніцкай грамады, Т-ва бел. школы. У 1927 арыштаваны польск. ўладамі і зняволены на 8 гадоў. Вызвалены датэрмінова ў 1930. З 1933 старшыня, прадстаўнік Бел. дабрачыннага т-ва ў Бел. нац. к-це ў Вільні. У 1933 выдаваў (з У.Казлоўскім) часопіс бел. нацыянал-сацыялістаў *«Новы шлях»*, пачаў ствараць *Беларускую нацыянал-сацыялістычную партыю*. З 1939 старшыня Бел. бюро прапаганды пры Мін-ве прапаганды Германіі ў Берліне. У 1940 старшыня Бел. к-та ў Варшаве. З пач. 1941 заг. школы прапагандыстаў пад Берлінам. Застрэлены партызанамі ў час знаходжання ў Мінску. *Я.Вапа.*

**АКІНШЭ́ВІЧ** Леў Аляксандравіч (6.2.1898, С.-Пецярбург — 1980), бел. і ўкр. гісторык. Вучыўся ў Кіеўскім ун-це (з 1916), скончыў Кіеўскую вайск. школу (1918). У 1918 прыняў грамадзянства БНР. З 1921 працаваў ва Укр. АН. Супрацоўнічаў з бел. час. «Полымя», Інбелкультам і Бел. АН. З 1933 праф. Нежынскага пед. ін-та. Абвінавачаны ў бел. і ўкр. «бурж. нацыяналізме» і звольнены. З канца 1930-х г. працаваў у Смаленску. У час Вял. Айч. вайны жыў на Украіне. З 1944 у Зах. Германіі, затым у ЗША. У 1950-я г. працаваў у цэнтры па вывучэнні СССР у Вашынгтоне. Вывучаў гісторыю Беларусі і Украіны 16—17 ст.; супрацоўнічаў з Бел. ін-там навукі і мастацтва ў Нью-Йорку. Аўтар прац пра сав. арбітраж і гістарыяграфію. *Ю.Р.Васілеўскі.*

Акінак з залатой абкладкаю ножнаў. 4 ст. да н.э. Курган Тоўстая магіла (Днепрапятроўская вобл., Украіна).

**АКІСЛЕ́ННЕ** ў хіміі, працэс злучэння якога-н. рэчыва з кіслародам; хімічная рэакцыя, пры якой адбываецца адыманне электронаў ад атамаў, пераразмеркаванне электроннай шчыльнасці паміж атамамі (гл. *Акісленне-аднаўленне*). Ступень А. не заўсёды адпавядае валентнасці атама і можа быць адмоўнай або дадатнай велічынёй. Сярод працэсаў А. вылучаюцца: А. арган. злучэнняў, у тл. нафтапрадуктаў, *акісленне металаў* і *акісленне біялагічнае*. Сучаснае разуменне механізма А. арган. злучэнняў засн. на пераксіднай тэорыі, паводле якой з кіслародам рэагуюць злучэнні, што папярэдне перайшлі ў актыўны стан (гл. *Пераксіды арганічныя*). Пачатковая стадыя А. — *ланцуговая хімічная рэакцыя*. Актыўныя акісляльнікі — кісларод $O_2$, азон $O_3$, пераксід вадароду $H_2O_2$, хлор $Cl_2$, фтор $F_2$, перманганат калію $KMnO_4$ і інш.

**АКІСЛЕ́ННЕ БІЯЛАГІ́ЧНАЕ**, біяхімічны працэс, сукупнасць акісляльна-аднаўляльных рэакцый. Адбываецца ва ўсіх жывых клетках (пераважна ў мітахондрыях), складае аснову тканкавага *дыхання* і *браджэння*. Асн. функцыя А.б. — забеспячэнне арганізма энергіяй, якая паступова вызваляецца з арган. рэчываў пры перадачы аднаўляльных эквівалентаў (АЭ) — пратонаў і электронаў (ці толькі электронаў) ад донара да акцэптара (з прычыны рознасці іх *акісляльна-аднаўляльных патэнцыялаў*) і назапашваецца пераважна ў форме багатых энергіяй сувязяў *адэназінтрыфосфарнай кіслаты* (АТФ) і інш. макраэргічных злучэнняў. У аэробаў (большасць жывёл і раслін, многія мікраарганізмы) канчатковы акцэптар АЭ — кісларод. Пастаўшчыкі АЭ — арган. і неарган. рэчывы. Найб. значэнне мае А.б., якое адбываецца пры *гліколізе*, акісленні α-кетаглутаравай к-ты і пры пераносе АЭ у ланцугу акісляльных (дыхальных) ферментаў (гл. *Акісляльнае фасфарыліраванне*). У разліку на 1 малекулу глюкозы гліколіз дае 2, акісляльнае фасфарыліраванне ў дыхальным ланцугу — 34 малекулы АТФ. У працэсе дыхання адбываецца паслядоўнае многаступеньчатае акісленне вугляводаў, тлушчаў і бялкоў, што прыводзіць да аднаўлення асн. пастаўшчыкоў АЭ для дыхальнага ланцуга, якое ў значнай ступені ажыццяўляецца ў *трыкарбонавых кіслот цыкле*. Мяркуюць, што

гліколіз, цыкл трыкарбонавых кіслот і дыхальны ланцуг функцыянуюць у клетках усіх эўкарыётаў. Рэакцыі А.б. ў клетках каталізуюць *аксідарэдуктазы*. Акісляльныя рэакцыі, аднак, не заўсёды суправаджаюцца назапашваннем энергіі. Яны таксама нясуць функцыі пераўтварэння рэчываў (напр., пры ўтварэнні жоўцевых к-т, стэроідных гармонаў, на шляхах метабалізму амінакіслот і інш.). Акісленнем абясшкоджваюцца многія чужародныя і таксічныя для арганізма рэчывы (араматычныя злучэнні, недаакісленыя прадукты дыхання і інш.). Такое А.б. наз. свабодным акісленнем і суправаджаецца ўтварэннем цяпла. Мяркуюць, што сістэма пераносу электронаў, якая ажыццяўляе акісляльнае фасфарыліраванне, здольная пераключацца на свабоднае акісленне пры павелічэнні патрэбнасці ў цяпле.

Вывучэнне працэсаў акіслення ў арганізме пачалося ў 18 ст. з прац А.Лавуазье. Вял. заслуга ў даследаванні А.б. належыць У.І.*Паладзіну* (разглядаў А.б. як ферментацыйны працэс). Значны ўклад зрабілі таксама сав. вучоныя А.М.Бах, У.А.Энгельгарт, У.А.Беліцэр, С.Я.Севярын, У.П.Скулачоў, ням. О.Варбург, Г.Віланд, англ. Д.Кейлін, Х.Крэбс, П.Мітчэл, амер. Д.Грын, А.Ленінджэр, Б.Чанс, Э.Рэкер і інш. (лакалізацыя А.б. ў клетцы, сувязь з інш. працэсамі абмену рэчываў, механізмы ферментацыйных акісляльна-аднаўляльных рэакцый, акумуляцыя і пераўтварэнне энергіі і інш.). Гл. таксама *Біяэнергетыка*.

На Беларусі розныя аспекты А.б. вывучаюць у ін-тах біяарганічнай хіміі, фотабіялогіі, фізіялогіі, біяхіміі (Гродна) АН, БДУ.

*Літ.*: Кривобокова С.С. Биологическое окисление: Ист. очерк. М., 1971; Ленинджер А. Основы биохимии: Пер. с англ. Т. 1—3. М., 1985; Строев Е.А. Биологическая химия. М., 1986; Березов Т.Т., Коровкин Б.Ф. Биологическая химия. 2 изд. М., 1990. *М.М.Філімонаў.*

**АКІСЛЕ́ННЕ МЕТА́ЛАЎ**, рэакцыя злучэння металаў з кіслародам з утварэннем *аксідаў*; рэакцыя, у якой атамы металу страчваюць электроны і ўтвараюць розныя злучэнні (сульфіды, хларыды і інш.). У прыродзе металы знаходзяцца ў акісленым стане (у выглядзе рудаў). А.м. і іх сплаваў — аснова *карозіі*. У металургіі А.м. прыводзіць да ўтварэння *акалінаў*, страты каштоўных легіравальных элементаў і жалеза. У некат. выпадках А.м. выкарыстоўваецца з ахоўнымі ці дэкар. мэтамі (гл. *Аксідаванне*).

**АКІСЛЕ́ННЕ-АДНАЎЛЕ́ННЕ**, акісляльна-аднаўляльныя рэакцыі, хімічныя рэакцыі, пры якіх адбываецца пераход электронаў ад атамаў, малекул ці іонаў аднаго злучэння да атамаў, малекул і іонаў другога. Паводле электроннай тэорыі акіслення вызначаецца як страта (напр., $Zn-2e = Zn^{2+}$), а аднаўленне як далучэнне (напр., $Cl_2 + 2e = 2Cl^-$) электронаў. Рэчыва, якое далучае электроны, наз. акісляльнікам, а якое іх страчвае — аднаўніцелем. А.-а. ўзаемазвязаныя працэсы, якія адбываюцца адначасова: $Zn + Cl_2 = Zn Cl_2$ ($Zn$ аднаўнік, акісляецца да $Zn^{2+}$, а $Cl_2$ акісляльнік, аднаўляецца да $2Cl^-$). Важнейшыя акісляльнікі: кісларод, хлор, пераксід вадароду, марганцавакіслы калій і інш. Аднаўляльнікі: вугаль, вадарод, ёдзісты калій, аксід вугляроду і інш. Пры складанні ўраўненняў А.-а. ўлічваецца электраадмоўнасць атамаў (здольнасць атама ў малекуле прыцягваць і ўтрымліваць электроны) і *акіслення ступень*. Перамяшчэнне электронаў у А.-а. адбываецца за кошт розніцы энергій сувязі, у аднаўляльніку электроны звязаны слабей.

Рэакцыямі А.-а. карыстаюцца пры атрыманні металаў і неметалаў, розных хім. прадуктаў (аміяку, азотнай і сернай кіслот і інш.), яны ляжаць у аснове *гарэння* ўсіх відаў паліва, *карозіі* металаў, электролізу раствораў і расплаваў, дзеяння хім. крыніц току. Уласціва біял. сістэмам (гл. ў арт. *Акісленне біялагічнае, Фотасінтэз*).




**Спрошчаная схема акісляльнага фасфарыліравання.**

**АКІСЛЕ́ННЕ СТУПЕ́НЬ**, акіслення лік, умоўны паказчык, які характарызуе зарад атама ў хім. злучэннях. У малекулах з іоннай сувяззю супадае з зарадам іонаў, напр., у NaCl а.с. Na + + I, Cl -I. У злучэннях з кавалентнай сувяззю за а.с. прымаецца зарад, які атрымаў бы атам, калі б усе пары электронаў гэтай сувязі былі цалкам зрушаны ў бок больш электраадмоўных атамаў. Электронныя пары, абагульненыя аднолькавымі атамамі, дзеляцца папалам. А.с. выкарыстоўваецца пры складанні ўраўненняў рэакцый *акіслення-аднаўлення*, пры класіфікацыі неарган. злучэнняў, асабліва каардынацыйных (гл. *Комплексныя злучэнні*).

**АКІСЛЯ́ЛЬНА-АДНАЎЛЯ́ЛЬНЫ ПАТЭ́НЦЫЯЛ**, рэдакс-патэнцыял, значэнне *свабоднай энергіі* дынамічна ўраўнаважанай акісляльна-аднаўляльнай сістэмы ў электрахім. працэсе; раўнаважны *электродны патэнцыял*. Характарызуе пэўнае электралітычнае асяроддзе. Напр., у водным растворы хларнага жалеза іоны $Fe^{3+}$ захопліваюць свабодныя электроны з электрода з неакісляльнага металу (плаціна, золата) і аднаўляюцца да іонаў $Fe^{2+}$. Пасля дасягнення пэўнай канцэнтрацыі $Fe^{2+}$ у растворы пачынаецца адваротны працэс. Праз пэўны час скорасці рэакцый *акіслення-аднаўлення* ўраўнаважваюцца і на электродзе ўстанаўліваецца А.-а.п., які вызначаецца ў *вольтах*. Чым большая акісляльная здольнасць асяроддзя, тым вышэйшы А.-а.п. Карыстаюцца ў электрахім. метадах сінтэзу рэчываў, пры даследаваннях у біял. і аналітычнай хіміі.

**АКІСЛЯ́ЛЬНАЕ ФАСФАРЫЛІ́РАВАННЕ**, біясінтэз малекул адэназінтрыфосфарнай к-ты (АТФ) з адэназіндыфосфарнай (АДФ) і фосфарнай к-т за кошт энергіі акіслення субстрату: АДФ + + $H_3PO_4$ → АТФ + $H_2O$ (гл. *Акісленне біялагічнае*). Асн. субстратам для А.ф. служаць малекулы арган. рэчываў, пераважна арган. к-т, якія ўтвараюцца ў *трыкарбонавых кіслот цыкле*. А.ф. адкрыта сав. біяхімікам У.А.Энгельгартам (1930). Адбываецца ў жывых клетках (у мітахондрыях) пры пераносе электронаў і пратонаў па дыхальным ланцугу з удзелам значнай колькасці дыхальных ферментаў і каферментаў (ферментны комплекс АТФ-сінтэтаза). Паказчык эфектыўнасці А.ф. — адносіны колькасці фасфату, звязанага АДФ пры А.ф., да паглынутага кіслароду (Р/О). Малекула АТФ утвараецца пры пераносе 2 электронаў праз пункт энергет. злучэння, у якім адбываецца утылізацыя энергіі, што вызваляецца. У выніку А.ф. ў клетках назапашваецца АТФ — важнейшае макраэргічнае злучэнне, якое забяспечвае розныя працэсы жыццядзейнасці. *М.М.Філімонаў.*

**АКІСЛЯ́ЛЬНЫ ЛІК**, гл. *Акіслення ступень*.

**А́КІТА**, горад у Японіі, на ПнЗ в-ва Хонсю. Адм. ц. прэфектуры Акіта. 298 тыс. ж. (1987). Нафтаперапрацоўка. Нафтахім., дрэваапр., цэлюлозна-папяровая, эл.-тэхн. прам-сць, каляровая металургія, выплаўка спец. сталі. Порт А. — Цутыдзакі на Японскім м. Ун-т.

**АКІХІ́ТА** (н. 23.12.1933, Токіо), імператар Японіі. Старэйшы сын імператара *Хірахіта*. Скончыў ун-т Гакусюін (1956). 10.11.1952 абвешчаны наследным прынцам. У час хваробы бацькі з 22.9.1988 да 7.1.1989 выконваў абавязкі імператара. З 7.1.1989 імператар (125-ы).

**АКІЯ́Н**, у грэчаскай міфалогіі бажаство аднайменнай ракі, якая абмывае зямлю; на крайнім захадзе абмывае мяжу паміж светам жыцця і смерці. Сын *Урана* і *Геі*, брат і муж Тэфіды, з якой ён нарадзіў 3 тыс. дачок (акіянід) і столькі ж сы-

ноў — рачных патокаў. А. вядомы міралюбствам і дабрынёй, ён не ўдзельнічаў у бітве *тытанаў* супраць *Зеўса*, таму захаваў сваю ўладу і давер *алімпійцаў*.

**АКІЯ́Н**, Сусветны акіян (ад грэч. Okeanos вялікая рака, якая абцякае Зямлю), неперарыўная водная абалонка Зямлі, якая акружае мацерыкі і астравы, мае агульны салявы састаў. Пл. 361,06 млн. км$^2$. А. займае каля 70,8% зямной паверхні (60,7% Паўн., 80,9% Паўд. паўшар'яў). Сярэдняя глыб. 3795 м, макс. 11 022 м (Марыянскі жолаб у Ціхім ак.). Складае 94% гідрасферы. Змяшчае 1370 млн. км$^3$ вады (гл. табл.), што складае 0,1% ад аб'ёму зямнога шара. Паводле фізіка-геагр. уласцівасцяў акваторыя А. падзяляецца на *Ціхі акіян*, *Атлантычны акіян*, *Індыйскі акіян*, *Паўночны Ледавіты акіян*. Умоўна вылучаецца *Паўднёвы акіян* вакол Антарктыды. Вывучае А. *акіяналогія*.

**Асноўныя морфаметрычныя паказчыкі акіянаў**

| Акіяны (з морамі) | Плошча | | Аб'ём, млн. км$^3$ | Глыбіня, м | |
|---|---|---|---|---|---|
| | млн. км$^2$ | % ад плошчы Сусветнага акіяна | | сярэдняя | макс. |
| Ціхі | 179,68 | 50 | 724 | 3984 | 11 022 |
| Атлантычны | 93,36 | 25 | 337 | 3926 | 8428 |
| Індыйскі | 74,92 | 21 | 292 | 3897 | 7130 |
| Паўночны Ледавіты | 13,1 | 4 | 17 | 1205 | 5449 |
| Сусветны | 361,06 | 100 | 1370 | 3795 | 11 022 |

**Рэльеф і геалагічная будова дна**. У рэльефе дна вылучаюцца 4 планетарныя морфаструктуры. *Падводная ўскраіна мацерыкоў* — затопленая частка мацерыковых платформаў з адносна спакойным тэктанічным рэжымам. Характарызуецца кантынентальным тыпам зямной кары магутнасцю да 35 км. Займае глыбіні да 1400—3200 м. Падзяляецца на *шэльф*, *мацерыковы схіл* і *мацерыковае падножжа*. На большай частцы перыферыі Ціхага ак., на ПнУ Індыйскага, а таксама ў морах Карыбскім, Міжземным і Скоша (Скотыя) паміж мацерыковым падножжам і ложам А. выяўлена пераходная зона з геасінклінальным тыпам зямной кары (гл. *Геасінкліналь*), дзе адбываюцца сціскание зямной кары, інтэнсіўныя вертыкальныя рухі, сейсмічнасць і вулканізм, якія па-рознаму праяўляюцца ў межах зоны. Да яе прымеркаваны глыбакаводныя жалабы. Адзін з гал. элементаў рэльефу і тэктанічных структур дна — *ложа акіяна*. Займае самыя глыбокія, акрамя глыбакаводных жалабоў, часткі (4000—7000 м). Яму ўласцівы тонкая (да 8 км) *акіянская кара*, асаблівы тып вулканізму і разломнай тэктонікі, слабая сейсмічнасць, запаволеныя адмоўныя рухі. Рэльеф дна ўтвораны чаргаваннем вял. катлавін і падняццяў. Над ложам А. на выш. 4—5 км, зрэдку да 10 км узнімаюцца *сярэдзінна-акіянскія хрыбты*. Яны распасціраюцца праз усе А., маюць рыфтагенальны тып зямной кары, характарызуюцца лінейнымі магнітнымі анамаліямі, высокай сейсмічнасцю і вулканізмам. У рэльефе спалучаюцца рыфтавыя даліны і хрыбты, папярочныя разломы, вулканічныя масівы, плато, гаёты.

**Паходжанне акіяна**. Мяркуюць, што воды А. маглі ўтварыцца пры дэферэнцыяцыі мантыі Зямлі. Паводле тэорыі тэктонікі пліт, А. ўзніклі пры распадзе стараж. мацерыкоў, калі часткі мацерыкоў рассоўваліся ў процілеглыя бакі. Лічыцца, што Атлантычны ак. утварыўся каля 160—180 млн. гадоў назад (юрскі перыяд), Ціхі і Індыйскі ак. ўзніклі раней.

**Донныя адклады**. Магутнасць акіянскіх адкладаў вагаецца ад 2000—3000 м у прымацерыковых зонах да дзесяткаў метраў на сярэдзінна-акіянскіх хрыбтах. Адзначаны 3 зоны макс. магутнасці адкладаў: каля экватара, на Пн ад 40° паўн. ш. і на Пд ад 40° паўд. ш. Узрост асадкавай тоўшчы мяняецца ад восевай часткі сярэдзінна-акіянскіх хрыбтоў (пліяцэн-плейстацэн) да краяў.

Акіхіта.




Папярочны профіль акіяна.




Да арт. Акіян. Тыпы морфаскульптур дна: 1 — абразійна-акумулятыўныя і шэльфавыя няхвалевыя; 2 — гравітацыйныя (дэнудацыйныя і акумулятыўныя); 3 — абісальныя акумулятыўныя; 4 — абісальныя акумулятыўна-дэнудацыйныя ў межах горнага рэльефу; 5 — абісальныя акумулятыўна-дэнудацыйныя, створаныя глыбіннымі доннымі цячэннямі; 6 — біягенныя (каралавыя рыфы).

вых частак А., дзе яны больш старажытныя. Сярод донных адкладаў вылучаюць тэрыгенныя, якія ўтвараюцца ў выніку размывання сушы, біягенныя (карбанатныя і крамяністыя), вулканагенныя, палігенныя (змешанага паходжання) і аўтыгенныя (аалітавыя і жалеза-марганцавыя канкрэцыі). Найб. плошчы дна А. займаюць карбанатныя глеі (каля 150 млн. км$^2$) і глыбакаводная чырвоная гліна (больш за 110 млн. км$^2$, гл. *Марскія адклады*)..

**Хімізм і салёнасць вады**. У акіянскай вадзе растворана каля 80 хім. элементаў, сярэдняя канцэнтрацыя іх каля 35 г/л. Усяго ў А. растворана $5 \cdot 10^{22}$ г соляў. Салёнасць вады выражаецца ў праміле, абазначаецца ‰ (1‰ адпавядае 1 г/1 кг). Сярэдняя салёнасць вады на паверхні 34,7‰, у адкрытым А. — ад 31,4‰ у Паўн. Ледавітым ак. да 37,25‰ у трапічных водах Атлантычнага ак., каля берагоў Антарктыды 33,93‰, на экватары 32—34‰. У Паўн. паўшар'і салёнасць А. ніжэйшая, чым у Паўднёвым. Пераважаюць солі хларыдаў натрыю і магнію (88,7‰) і сульфатаў магнію, кальцыю і калію (10,9‰; гл. таксама *Марская вада*). У вадзе растворацы таксама кісларод (паступае з атмасферы і ўтвараецца зялёнымі водарасцямі), вуглякіслы газ і інш., ад якіх залежыць жыццё арганізмаў у А. У халоднай вадзе растворанага кіслароду больш (у палярных шыротах у прыпаверхневых водах да 10 мл/л, у цёплых трапічных шыротах 4 мл/л). На глыб. 1000 м і глыбей растворанага ў вадзе кіслароду 2—3 мл/л. У маларухомых частках А. на глыбіні намнажаецца серавадарод ад перагнівання арган. рэшткаў.

**Тэмпературны рэжым**. Гал. крыніцай цяпла, што вызначае т-ру вады А., з'яўляецца сонечная радыяцыя, 3 — 45% якой у залежнасці ад вышыні Сонца над гарызонтам і ад хвалявання адбіваецца ў сусветную прастору (гл. *Альбеда*). Больш за 99% сонечнай радыяцыі, якая ўвайшла ў ваду А., паглынаецца ў яе верхніх слаях. А. з'яўляецца акумулятарам цяпла і моцна ўплывае на клімат Зямлі. Сярэднегадавая т-ра вады на паверхні А. 17,5 °С (у Паўн. паўшар'і яна вышэй, чым у Паўд.). Самы цёплы А. — Ціхі (19,4 °С), самы халодны — Паўн. Ледавіты (-0,8 °С). Тэрмічны экватар у А. ссунуты на Пн ад геаграфічнага (сярэдняя т-ра вады складае 26—28 °С), у палярных шыротах яна блізкая да нуля або адмоўная (-1,5, -1,9 °С). З глыбінёй т-ра знікаецца, на глыб. 1000 м яна ніжэй за 5 °С, у прыдоннай зоне складае 1,4—1,8 °С, у палярных абласцях ніжэй за 0 °С (-0,5, -1,5 °С).

**Цыркуляцыя вады**. У А. існуе адзіная сістэма ўстойлівых цячэнняў (гл. *Марскія цячэнні*), якая забяспечвае перанос і ўзаемадзеянне водаў. Асн. паверхневыя цячэнні ўзнікаюць пад уплывам пастаянных вятроў. Цячэнні захопліваюць масы вады да глыб. 150—200 м і ўтвараюць антыцыкланальныя кругавароты ў трапічных і субтрапічных шыротах (пасатныя цячэнні) і цыкланальныя ва ўмераных і палярных шыротах. Паверхневыя цячэнні, накіраваныя ад экватара да полюсаў, цёплыя, у адваротным напрамку — халодныя. Прынос да берагоў мацерыкоў цёплай вады цячэннямі і нагнанне паветр. масаў над імі моцна ўплываюць на клімат прыбярэжных і далёкіх ад А. краін (зімовыя адлігі на Беларусі тлумачацца прытокам цёплага паветра з Атлантычнага ак.). Каля ўзбярэжжаў мацерыкоў назіраецца выхад на паверхню глыбінных водаў А. (гл. *Апвелінг*), якія багатыя пажыўнымі рэчывамі і спрыяюць развіццю разнастайных арганізмаў. Падняцце водаў на паверхню ў адкрытым А. адбываецца ў месцах разыходжання цячэнняў (у зонах дывергенцыі) і ў цыкланальных кругаваротах. Апусканне водаў звязана з канвергентнымі зонамі, дзе сутыкаюцца цячэнні, і з антыцыкланальнымі кругаваротамі. Глыбінныя цячэнні ўзнікаюць ад рознай шчыльнасці вады. У прыдоннай зоне існуюць арктычныя і асабліва развітыя антарктычныя цячэнні, якія дасягаюць 30—40° паўн. ш.

Хвалі ў А. выклікаюцца вятрамі, хуткай зменай атм. ціску (гл. *Сейшы*), моратрасеннямі (гл. *Цунамі*). *Прылівы* (і адлівы) абумоўлены прыцяжэннем Месяца і Сонца (прыцяжэнне Месяца ўдвая большае за сонечнае). У адкрытым А. вышыня прыліваў каля 1—2 м, у залівах да 18 м (Фанды на Атлантычным узбярэжжы Канады).

**Арганічны свет**. Жывыя арганізмы насяляюць А. ад паверхні да найбольшых глыбіняў. Паводле месцаў існавання адрозніваюць *планктон* (пасіўнаплаўныя), *нектон* (актыўнаплаўныя) і *бентас* (донныя арганізмы). Па экалагічных умовах вылучаюцца супольніцтвы *літаралі* і *пелагіялі*. У А. існуе каля 160 тыс. відаў жывёл: 80 тыс. малюскаў, больш за 20 тыс. ракападобных, 16 тыс. рыб, каля 15 тыс. прасцейшых і інш. З млекакормячых ёсць ластаногія і кітападобныя (самая буйная жывёла на Зямлі — сіні кіт). У А. і на яго ўзбярэжжах жывуць шматлікія віды птушак. З 15 тыс. відаў раслін найбольш аднаклетачных водарасцяў (да 80% фітамасы А.).

**Прыродныя рэсурсы**. Рэсурсы А. падзяляюцца на біялагічныя (харчовыя), сыравінныя (мінеральныя, хімічныя, водныя), энергетычныя і рэкрэацыйныя. Штогод у А. здабываюць каля 75—80 млн. т морапрадуктаў (84,5% складае рыба, 11,4% беспазваночныя, 4,1% водная расліннасць). Здабываюць (% ад сусветнай здабычы) нафты каля 30, газу 20, брому 90, ільменіту 80, магнію 60, цыркону і рутылу 50, касітэрытаў 40, шмат жал. руды, золата, плацыны, алмазаў і інш. Мае значную кольказць энергіі розных відаў: прыліваў (ацэньваецца ў 1 млрд. кВт), цячэнняў, хваляў, розніцы т-ры і салёнасці і інш., агульная магутнасць якой прыкладна 200 млрд. т умоўнага паліва, што ў 20 разоў перавышае гадавую патрэбу ў свеце. Пабудаваны прыліўныя (у Францыі, Расіі, Кітаі і інш.) і гідратэрмальная (у Кот-д'Івуары) электрастанцыі. Вял. гасп. значэнне мае *марскі транспарт*.

**Ахова прыроднага асяроддзя**. Рэгламентацыя дзейнасці чалавека ў А. прадугледжана шэрагам міжнар. пагадненняў і заканадаўствам асобных дзяржаў. Міжнар. права ўсталёўвае рэжым работы па некалькіх кірунках: рэжым акваторый; гандлёвае суднаходства; ваеннае мараплаванне; навук. даследаванні; дно і нетры; ахова асяроддзя (захаванне марскога асяроддзя і экалагічнай раўнавагі пры выкарыстанні рэсурсаў А., прадухіленне забруджвання, асабліва радыенукліднага, падтрыманне біял., хім. і фіз. суадносін, недапушчальнасць прычынення шкоды фауне, флоры, дну, атмасферы і касм. прасторы над А.).

*Літ.*: Леонтьев О.К. Физическая география Мирового океана. М., 1982; Слевич С.Б. Океан: ресурсы и хозяйство. Л., 1988; Израэль Ю.А., Цыбань А.В. Антропогенная экология океана. Л., 1989; Богданов Д.В. Океаны и моря накануне XXI века. М., 1991; Океанографическая энциклопедия: Пер. с англ. Л., 1974.

*А.М.Вітчанка.*

**АКІЯНАГРА́ФІЯ** (ад *акіян* + *...графія*), 1) тое, што *акіяналогія*. 2) Раздзел акіяналогіі, навука, якая вывучае фіз.-хім. ўласцівасці акіянскіх водаў, заканамернасці фіз. і хім. працэсаў, з'яў у Сусветным акіяне, прыродныя ўмовы канкрэтных акіянаў, мораў або іх раёнаў.

**АКІЯНАЛО́ГІЯ** (ад *акіян* + *...логія*), акіянаграфія, сукупнасць навуковых дысцыплін аб фізічных, хімічных, геалагічных і біялагічных працэсах у Сусветным акіяне. Гал. задачы А.: высвятленне агульных заканамернасцяў прыроды акіяна, вывучэнне трансфармацыі і абмену рэчывам і энергіі ў акіянскіх водах і ахова іх ад забруджвання, выкарыстанне харчовых, хім. і энергет. рэсурсаў акіяна, распрацоўка доўгатэрміновых прагнозаў надвор'я на Зямлі, папярэджанне катастрафічных з'яў, звязаных з акіянамі, забеспячэнне эфектыўнасці і бяспекі надводнага і падводнага мараплавання.

Першымі даследчыкамі акіянаў былі стараж. мараплаўцы. Стараж.-грэч. вучоныя Геродот, Арыстоцель, Гіпарх і інш. выказвалі меркаванні аб адзінстве Атлантычнага і Індыйскага акіянаў, кругавароце вады ў прыродзе, прылівах і інш. з'явах. Перыяд інтэнсіўнага вывучэння звязаны з эпохай Вял. геагр. адкрыццяў (сярэдзіна 15—18 ст.; Х.Калумб, Ф.Магелан, Дж.Кук і інш.). Важныя вынікі атрыманы рус. Антарктычнай экспедыцыяй Ф.Белінсгаўзена і М.Лазарава на суднах «Усход» і «Мірны» (1820) і першай комплексная акіянаграфічнай экспедыцыяй на карвеце «Чэленджэр» (1872—76; Дж.Мерэй склаў першую карту акіянскіх глеяў). Да-

следаванні розных ч. Сусветнага ак. праводзілі С. Макараў на «Віцязі» (1886—89) і ледаколе «Ярмак» (1899, 1901), Ф.Нансен на «Фраме» (1891—96), ням. экспедыцыя на «Метэоры» (1925—27), Антарктычная англ. экспедыцыя на «Дысковеры-11» (1929—39) і інш. Пасля 2-й сусв. вайны А. становіцца адной з важных навук у сувязі з пачаткам выкарыстання рэсурсаў Сусветнага акіяна. Даследаванні акваторыі акіяна, складанне схемы рэльефу дна праводзяць н.-д. экспедыцыі розных краін (амер. з 1956 «Віма», з 1957 «Атлантык»; рус. з 1957 «Віцязь», з 1967 «Акадэмік Кніповіч», з 1974 «Дзмітрый Мендзялееў» і інш.). Грунтуецца А. на фактычных даных вымярэнняў, атрыманых з суднаў надвор'я, дрэйфуючых аўтам. гідраметэаралагічных станцый і акіянаграфічных платформаў, штучных спадарожнікаў Зямлі і падводных лабараторый. У сучаснай А. пашыраны матэм. мадэліраванне фіз., хім. і біял. працэсаў, даследаванне зменлівасці іх на падставе тэорыі імавернасці і матэм. статыстыкі.

Фізіка акіяна даследуе фіз. працэсы ў акіянскіх і марскіх водах, заканамернасці ўзаемадзеяння акіяна і атмасферы; хімія акіяна вывучае хім. ўласцівасці, састаў, фіз. і хім. працэсы водаў; геалогія акіяна — паходжанне ложа акіяна, яго эвалюцыю і будову, рэльеф дна, заканамернасці ўтварэння карысных выкапняў; біялогія акіяна — жывёльны і раслінны свет акіянаў і мораў, фарміраванне біял. прадукцыйнасці акіянскіх і марскіх водаў. Вылучаюць А. рэгіянальную, якая займаецца фізіка-геагр. і эканоміка-геагр. даследаваннем акіянаў і мораў; прамысловую, звязаную з акіяналагічным забеспячэннем марскіх промыслаў; спадарожнікавую (касмічную), якая атрымлівае вымярэнні разнастайных параметраў акіяна са штучных спадарожнікаў. Акіянскія даследаванні каардынуюцца Навук. к-там па акіянскіх даследаваннях, Міждзярж. акіянаграфічнай камісіяй пры ЮНЕСКА, нац. гідраметэацэнтрамі і н.-д. ін-тамі.

*А.М.Вітчанка.*

**АКІЯНА́РЫУМ**, басейн з марской вадой для ўтрымання марскіх жывёл: беспазваночных, рыб, паўзуноў, млекакормячых. Звычайна мае некалькі басейнаў рознага аб'ёму, адна бакавая яго сценка празрыстая для назірання. У невял. А. трымаюць дробных рыб і беспазваночных, у буйных — вял. рыб, чарапах, ластаногіх, сірэн, кітападобных. Разнавіднасць А. — дэльфінарыі, дзе трымаюць дэльфінаў для вывучэння, дрэсіроўкі і паказу. Найб. колькасць А. у ЗША і Японіі. У Стэйнхарцкім А. (г. Сан-Францыска, ЗША) 178 дэманстрацыйных, 192 запасныя *акварыумы* і басейны аб'ёмам ад 0,07 да 300 м$^3$; у А. «Сі Уорлд» (г. Сан-Дыега, ЗША) выдатная калекцыя рыб. А. ёсць паблізу Ганалулу на Гавайскіх а-вах, а таксама ў Батумі (Аджарыя) і Клайпедзе (Літва). Маюць вял. значэнне як культ.-асв., турыстычныя і н.-д. цэнтры.

**АКІЯ́НІЯ**, самая вял. сукупнасць астравоў (каля 10 тыс.) у цэнтр. і паўд.-зах. ч. Ціхага ак. паміж Аўстраліяй, Малайскім архіпелагам на З і шырокімі акіянскімі прасторамі на Пн, У і Пд. Размешчана паміж субтрапічнымі шыротамі Паўн. паўшар'я і ўмеранымі Паўднёвага. Пл. 1,26 млн. км$^2$. Нас. 10,3 млн. чал. (1987). Найбольшыя а-вы Новая Гвінея, Паўночны і Паўднёвы (2 апошнія ўваходзяць у склад Новай Зеландыі) займаюць у сукупнасці каля 80% тэр. А. Пры падзеле сушы на часткі свету А. звычайна аб'ядноўваюць з Аўстраліяй; часам вылучаюць як асобную частку свету. У А. размешчаны дзяржавы (1993): Вануату, Зах.Самоа, Кірыбаці, Мікранезія, Маршалавы Астравы, Науру, Новая Зеландыя, Палау, Папуа — Новая Гвінея, Саламонавы Астравы, Тонга, Тувалу, Фіджы, ч. Інданезіі. Гавайскія а-вы — штат ЗША. Многія а-вы — уладанні Вялікабрытаніі, Францыі, ЗША, Аўстраліі, Новай Зеландыі, Чылі.

Паводле прыродных умоў і насельніцтва А. падзяляюць на *Меланезію*, *Мікранезію*, *Палінезію* і *Новую Зеландыю*. Ёсць астравы мацерыковага паходжання (Новая Гвінея, Новая Каледонія, Фіджы), гарыстыя вулканічныя (Бугенвіль, Гаваі і інш.) і нізінныя каралавыя (Маршалавы, Науру і інш.) а-вы. Найб. выш. — 5029 м (г. Джая ў Новай Гвінеі). Гарыстыя а-вы А. размешчаны ў межах астраўных дугаў геасінклінальнай вобласці зах. ускраіны дна Ціхага ак. У цэнтр. ч. Ціхага ак. — найвыш. вулканы, якія ўтвараюць некаторыя з Гавайскіх а-воў (у т.л. Маўна-Кеа і Маўна-Лоа, больш за 4000 м); актыўны вулканізм і ў Новай Зеландыі. Радовішчы нікелю і жалеза (Новая Каледонія), фасфатаў (Науру), нафты (Новая Гвінея), золата (Папуа — Новая Гвінея, Фіджы), вугалю (Новая Зеландыя), медзі (Бугенвіль, Новая Каледонія), жал. руды (Новая Гвінея) і інш. Клімат акіянскі, вільготны, пераважна субэкватарыяльны і экватарыяльны, на Пд субтрапічны і ўмераны. У экватарыяльным поясе сярэднямесячная т-ра на працягу года 26—28 °С, на крайнім Пд ад 16 °С (люты) да 5 °С (жнівень). Ападкаў за год ад 1000 мм на У да 3000—4000 мм і больш на З (асабліва шмат на наветраных схілах гарыстых а-воў, напр., на Гавайскіх а-вах месцамі да 14000 мм). У цэнтр. А. і на З частыя тайфуны. У гарах Новай Гвінеі і на в-ве Паўднёвы Новай Зеландыі ледавікі. Рэкі кароткія, мнагаводныя, пераважна на буйных а-вах. Глебы чырваназёмы і латэрыты, у раёнах сезонных дажджоў — чырвона-бурыя саваннаў, у вільготных раёнах — балотныя і забалочаныя. На наветраных схілах гарыстых а-воў пераважаюць вільготныя вечназялёныя трапічныя лясы, на падветраных — ксерафітныя лясы, хмызняковыя фармацыі. Трапляецца расліннасць тыпу саваннаў. На нізінных каралавых а-вах — зараснікі хмызняку, участкі лясоў, гаі какосавых пальмаў, хлебнага дрэва і інш. Асн. культурныя расліны — сагавыя і какосавыя пальмы, манга, цукр. трыснёг і інш. Фаўна А. — аўстралійскія (яхідна, сумчатыя) і азіяцкія (дзік) віды; мала млекакормячых, мноства насякомых; каля 650 відаў птушак; шмат эндэмікаў.

**АКІЯ́НСКАЕ ПАЎША́Р'Е**, умоўная палавіна сферычнай паверхні Зямлі, у межах якой Сусветны ак. (гл. *Акіян*) найб. пакрывае зямны абшар (пад сушай 9%

Да арт. Акіянія. Паўднёвы востраў. Новая Зеландыя.

Да арт. Акіянія. Вёска ў Папуа—Новай Гвінеі.

АКІЯНІЯ
Маштаб 1:50 000 000
Граніцы дзяржаў
ТАРАВА Сталіцы дзяржаў
КОРАР Цэнтры ўладанняў
МІКРАНЕЗІЯ
ПАЛІНЕЗІЯ
МЕЛАНЕЗІЯ
ФЕДЭРАТЫЎНЫЯ ШТАТЫ МІКРАНЕЗІІ
МАРШАЛАВЫ АСТРАВЫ
ПАЎНОЧНЫЯ МАРЫЯНСКІЯ АСТРАВЫ (ЗША)
САЙПАН
АГАНЬЯ
ПАЛІКІР
МАДЖУРА
КОРАР
ТАРАВА
ЯРЗНО НАУРУ
ФУНАФУЦІ
ПАПУА-НОВАЯ ГВІНЕЯ
ПОРТ-МОРСБІ
ХАНІЯРА
САЛАМОНАВЫ АСТРАВЫ
ВАНУАТУ
ПОРТ-ВІЛА
ФІДЖЫ
СУВА
НУМЕА
НУКУАЛОФА
АВАРУА
ПАПЕЭТЭ
ТОНГА
ФРАНЦУЗСКАЯ ПАЛІНЕЗІЯ
МАТА-УТУ
АПІЯ
ПАГА-ЛАГА
КІРЫБАЦІ
ГАНАЛУЛУ
АЎСТРАЛІЯ
КАНБЕРА
ВЕЛІНГТАН
НОВАЯ ЗЕЛАНДЫЯ
Паўночны тропік
Паўднёвы тропік
Экватар
Гавайскія а-вы (ЗША)
Маркізскія а-вы
Туамоту а-вы
Лайн а-вы
Фенікс а-вы
Таелау а-вы (Н.Зел.)
Кермадэк а-вы (Н.Зел.)
Чатэм а-вы (Н.Зел.)
Баунты а-вы (Н.Зел.)
Антыподаў а-вы (Н.Зел.)
Окленд а-вы (Н.Зел.)
Тубуаі а-вы
Гілберта а-вы
Маршалавы а-вы
Ралік а-вы
Ратак а-вы
Каліда а-вы
Тайвань (Кіт)
Лусон в.
Мінданао в.
Палаў (ЗША)
Гуам (ЗША)
Сулавесі в.
Тымор в.
Новая Гвінея в.
Новая Брытанія в.
Бугенвіль в.
Новая Каледонія (Фр.)
Новыя Гебрыды а-вы
Норфалк (Аўстрал.)
Лорд-Хау (Аўстрал.)
Тасманія в.
Паўночны в.
Паўднёвы в.
Кэмпбел (Н.Зел.)
Нуз (Н.Зел.)
Піткэрн (Брыт.)
Уэйк (ЗША)
Джонстан (ЗША)
Пальміра (ЗША)
Хаўленд (ЗША)
Бейкер (ЗША)
Джарвіс (ЗША)
Уэліс (Фр.)
Футуна (Фр.)
ЗАХ. САМОА
УСХОДНЯЯ САМОА (ЗША)
120°
140°
160°
180°
20°
0°

паверхні). Цэнтр паўшар'я знаходзіцца на У ад Новай Зеландыі. Гл. таксама *Мацерыковае паўшар'е.*

**АКІЯ́НСКАЯ КАРА́**, зямная кара пад акіянам. У адрозненне ад кантынентальнай мае невял. магутнасць (5—8 км) і пазбаўлена гранітна-гнейсавага слоя. Паводле скорасці праходжання сейсмічных хваляў у А.к. вылучаюць 3 слаі: верхні, асадкавы (магутнасць 0,3—0,7 км), сярэдні, з базальтавай лавы з тонкімі праслоямі шчыльных асадкаў (каля 0,8 км), і ніжні, акіянскі (4,1—5,8 км), які, верагодна, складаецца з габра, перыдатытаў і піраксенітаў. А.к. ўтвараецца ў зонах *спрэдзінгу сярэдзінна-акіянскіх хрыбтоў* і характарызуецца чаргаваннем палос з рознымі палеамагнітнымі ўласцівасцямі. *Г.У.Зінавенка.*

**АКІЯ́НСКІ КЛІ́МАТ**, гл. *Марскі клімат.*

**АКІЯ́НСКІЯ АДКЛА́ДЫ**, тое, што *марскія адклады.*

**АКІЯ́НСКІЯ АСТРАВЫ́**, астравы, якія ўзніклі ў межах ложа акіяна або сярэдзінна-акіянскіх хрыбтоў у выніку тэктанічных, вулканічных або арганагенных працэсаў. Гл. таксама *Востраў.*

**АКІЯ́НСКІЯ КАТЛАВІ́НЫ**, вялікія ўпадзіны ў межах ложа акіянаў, абмежаваныя падводнымі хрыбтамі, валамі і ўзвышшамі. А.к. могуць злучацца глыбокімі праходамі. Сярэдняя глыб. каля 5 тыс. м. Дно на 80% з узгорыста-выраўнаваным рэльефам (ваганні вышыняў 100—500 м).

**АКІЯ́НСКІЯ ХРЫБТЫ́**, гл. *Падводныя хрыбты.*

**АКІЯ́НСКІЯ ЦЯЧЭ́ННІ**, гл. *Марскія цячэнні.*

**АКЛАМА́ЦЫЯ** (ад лац. acclamatio крык, воклічы), прыняцце рашэння без правядзення галасавання, на падставе рэакцыі ўдзельнікаў, якая выяўляецца воклічамі, рэплікамі, апладысментамі і да т.п. Здараецца ў практыцы міжнар. арг-цый, канферэнцый і інш.

**АКЛАХО́МА** (Oklahoma), штат на Пд ЗША. Пл. 177,9 тыс. км², нас. 3231 тыс. чал. (1993), у т.л. 252,4 тыс. індзейцаў (1-е месца сярод штатаў). Адм. ц. — г. *Аклахома-Сіці.* У гарадах каля $^2/_3$ насельніцтва. Тэрыторыя пераважна раўнінная. На З Вялікія раўніны, на ПнУ плато Озарк, на ПдУ горы Уошыта. Сярэдняя т-ра студз. ад 0 да 6 °С, ліп. 24—27 °С. Ападкаў за год ад 450 мм на З да 1000 мм на У. Рэкі Арканзас і Рэд-Рывер. Прам-сць горназдабыўная (прыродны газ, нафта, гелій, цынк, каменны вугаль, медзь, серабро), маш.-буд. (прамысл. абсталяванне, пераважна буд. і нафтавае, аўтамабілі, самалёты), нафтаперапр., харч. і інш. Вырошчваюць пшаніцу, сорга, сеяныя травы, бавоўну, арахіс. Мясная і малочная жывёлагадоўля, авечка- і птушкагадоўля. Транспарт аўтамаб. і чыгуначны. Турызм.

**АКЛАХО́МА-СІ́ЦІ** (Oklahoma City), горад на Пд ЗША. Адм. ц. штата Аклахома. 445 тыс. ж., з прыгарадамі 963 тыс. ж. (1990). Трансп. вузел. Міжнар. аэрапорт. Гандл.-фінансавы цэнтр с.-г. раёна. Авіяц., аўтамаб., радыёэлектронная (у т.л. вытв-сць ЭВМ, сродкаў сувязі), хім., шынная, нафтаперапр., харч., паліграф. прам-сць. Металаапрацоўка, вытв-сць нафтавага абсталявання. Ун-т.


АКЛАХОМА
Маштаб 1:15 000 000
Аклахома
Ш
95°
УІЧЫТА
Пітсберг
Бартлсвіл
КАЛАРАДА
Ц Е Н Т Р А Л Ь Н Ы Я
Ц А Р А Ў Н І Н Ы
Ц І С У Р Ы
Ц І С У Р Ы
Ц І С У Р

чатковага, не сімвалічнага, сэнсу. Акмеісты аб'ядналіся ў «Цэх паэтаў» (1911—14; 1920—22), выдавалі час. «Гиперборей» (1912—13), альманахі.

**АКМЯ́НСКАЯ БІ́ТВА 1331**. Адбылася паміж літ.-бел. войскам ВКЛ і рыцарамі Тэўтонскага ордэна на р. Акмяна (Паўн. Літва). Ням. рыцары, уварваўшыся ў Жамойць, рабавалі і знішчалі насельніцтва. Жмудзіны папрасілі дапамогі ў ВКЛ. Вял. кн. Гедзімін сабраў войска з літ., полацкіх і новагародскіх дружын і даў бой рыцарам на чале з Генрыхам фон Плокам. Дзякуючы добраму размяшчэнню войскаў (наперадзе татарская конніца, пасярэдзіне літ. воіны, на флангах і ў рэзерве бел. дружыны) Гедзімін разбіў ворагаў і прымусіў іх уцякаць. Мясц. насельніцтва, гвалтоўна ўключанае ў тэўтонскае войска, у час бою перайшло на бок Гедзіміна. А.б. на пэўны час прыпыніла ням. агрэсію на землі ВКЛ.

**А́КНЕ КЕЛО́ІД**, сасочкавы дэрматыт галавы, склеразуючы фалікуліт патыліцы, хвароба мужчын. Існуе меркаванне, што ўзбуджальнік — залацісты стафілакок. На патыліцы на мяжы росту валасоў, зрэдку на падбародку з'яўляюцца дробныя вузельчыкі, якія групуюцца і зліваюцца паміж сабой. Скура робіцца цвёрдай, валасы растуць пучкамі. Пасля ўскрыцця фалікулярных вузельчыкаў застаюцца келоідныя рубцы.

**АКНО́**, канструкцыйна-мастацкі элемент пабудовы, які служыць для асвятлення, натуральнай вентыляцыі будынка. Найб. архаічнае А. — адтуліна ў 2 сумежных вянках драўлянай сцяны і валаковае (зачынялася звонку драўлянай засаўкай — волакам). У архітэктуры готыкі былі пашыраны вокны са спічастым завяршэннем, у архітэктуры рэнесансу, барока, класіцызму — прамавугольныя, лучковыя, арачныя, паўцыркульныя, падковападобныя, крыжовыя, у выглядзе разеткі або картуша, круглыя, авальныя і інш., якія аздабляліся філянговымі абрамленнямі, рустам, стылізаванымі порцікамі, завяршаліся франтонамі, сандрыкамі, *аканіцамі* і інш.

**АКО́ЛАВА** Валянціна Валянцінаўна (н. 25.7.1954, в. Мазуршчына Салігорскага р-на Мінскай вобл.), бел. паэтэса. Скончыла Полацкае муз.-пед. вучылішча імя Ф.Скарыны (1973), БДУ (1980). Настаўнічала, працавала журналісткай. Друкуецца з 1968. Аўтар зб. паэзіі «За тым лугам зеляненькім» (1987), «Вяртанне ў заўтра» (1990), «Я люблю сваю Белую Русь...» (1990), «Случарыны» (1994), фантаст. паэмы-п'есы «Палачанка Ігрэна, альбо Вяртанне Скарыны» (1990). Лірызм, выкарыстанне фалькл. матываў, вобразаў, стылістыкі — рысы лірыкі А. Апявае славутых жанчын Беларусі. Перакладае з рус. (зб. «Дзве песні» М.Цвятаевай, 1994), укр., славацкай моў. Паасобныя вершы А. пакладзены на музыку. *І.У.Саламевіч.*

Да арт. **Акно**.Схемы вокнаў: 1 — валаковае; 2 — прамавугольнае; 3 — квадратнае; 4 — рамбічнае; 5 — «картушовае»; 6 — круглае; 7 — прамавугольнае з трохгранным завяршэннем; 8 — прамавугольнае са спічастым завяршэннем; 9 — прамавугольнае з паўцыркульным завяршэннем; 10 — «венецыянскае»; 11 — спараныя вокны.




**Акоп** на аддзяленне: 1 — ячэйкі для стралка; 2 — ніша; 3 — пляцоўкі для кулямёта; 4 — прыбіральня; 5 — бліндаж (шчыліна); 6 — ход зносін; 7 — ячэйкі для стралка.

**АКО́ЛАЎСКАЕ РАДО́ВІШЧА ЖАЛЕ́ЗНЫХ РУ́ДАЎ**, у Беларусі, у Стаўбцоўскім р-не Мінскай вобл. Працягласць руднай зоны каля 10 км, магутнасць да 140 м. Руды — жалезістыя кварцыты (жалеза 26,2%), залягаюць у тоўшчы дакембрыйскіх гнейсаў крышт. фундамента на глыб. 216—300 м. Рудныя гарызонты (4—35 м) перамяжаюцца з праслоямі пустых парод. Запасы руды ацэньваюцца ў 1,5 млрд. т. Радовішча не распрацоўваецца (1995).

**АКО́ЛІЦА**, 1) тое, што *ваколіца*. 2) Тып сельскага паселішча ў Польшчы, Літве, на Украіне і Беларусі ў 16 — пач. 20 ст. Узнікла ў выніку *валочнай памеры* як паселішча дробнай шляхты, што не мела прыгонных і займалася сельскай гаспадаркай (гл. *Ваколічная шляхта*). На Беларусі найб. пашырана на З. У 2-й пал. 16 ст. ў Гродзенскім пав. існавала 37 А. У канцы 18 ст. ў Мінскай губ. было 70 А., у сярэдзіне 19 ст. — 149. Складалася з 3—70 двароў. Забудова была бессістэмная. Назвы пераважна па прозвішчах тых радоў, якія іх засялялі (Абуховічы, Кулікі, Эйсманты).

**АКО́ЛЬНІЧЫ**, прыдворны чын, другі пасля *баярына*, у Рускай дзяржаве ў 13 — пач. 18 ст. У 14—15 ст. А. ўваходзілі ў склад Думы вял. князёў, займалі пасады ваяводаў, намеснікаў, паслоў, стаялі на чале прыказаў. У 16—17 ст. блізкія да цара А. атрымалі баярскія званні.

**АКО́П**, адкрытае фартыфікацыйнае збудаванне, прызначанае для вядзення агню і ўкрыцця жывой сілы і ваен. тэхнікі. Стралковы А. (адзіночны, парны, на аддзяленне) мае роў, бруствер, берму і пляцоўкі для ўстаноўкі зброі; на аддзяленне абсталёўваецца і запаснымі кулямётнымі і гранатамётнымі пляцоўкамі, шчылінай або бліндажом, нішамі для боепрыпасаў, зброі і інш. Артыл. і мінамётны А. маюць пляцоўкі з прымкнутымі да іх раўкамі, у якіх робяцца нішы і шчыліны (бліндажы). А. для танкаў, БТР і інш. тэхнікі складаюцца з катлавана з *апарэллю*, шчыліны і зрэдку нішы для боепрыпасаў. А. маскіруюць пад фон навакольнай мясцовасці. У слабых грунтах іх умацоўваюць дзёрнам, галлём і інш. На забалочанай мясцовасці ствараюцца насыпныя А., зімой — снежныя.

**АКО́РД** (ад італьян. accordo сугучнасць), спалучэнне некалькіх гукаў рознай вышыні, якія ўспрымаюцца як гукавое адзінства. Асн. элемент *гармоніі*. Заканамернасць будовы А. — тэрцавасць складу (гукі размешчаны або шляхам перастановак могуць быць размешчаны па тэрцыях; гл. таксама *Абарачэнне*). Ніжні гук А. наз. асноўным тонам. Адрозніваюць 2 класы А.: тэрцавыя (трохгуччы, септакорды, акорды з секстай, нон-акорды, ундэцым- і тэрцдэцымакорды) і нятэрцавыя монаакор-

ды і поліакорды (А. складаная структуры, частка якіх, узятая асобна, можа разглядацца як А.). Выразнасць А. абумоўлена яго функцыяй, звязанай са становішчам А. ў ладзе, і фанізмам — характарам гучання, які залежыць ад інтэрвальнага складу, размяшчэння, рэгістра, муз. кантэксту. Найб. пашыраны А. тэрцавай будовы, ускладненыя храматычнай зменай гукаў — *альтэрацыяй*; некат. пашырэнне атрымалі А. квартавай будовы.

Перадформа А. — двухгучча ў раннім шматталоссі. Гістарычна першая канцэпцыя А. — у поліфанічнай музыцы канца 12 ст. Тэрмін «А.» узнік у 14 ст. У практыцы *генерал-баса* (17 — 1-я пал. 18 ст.) замацавалася аперыраванне А.-комплексамі, якія трактаваліся як кансанантныя і дысанантныя сугуччы. У 18—19 ст. катэгорыя А. супрацьпастаўляецца сугуччу з неакордавымі гукамі. У 20 ст. рэзка ўзмацнілася санорная трактоўка А. (гл. *Санорыка*), фактар гучнасці.

*Літ.*: Гуляницкая Н. Введение в современную гармонию. М., 1984.

**АКО́РДНАЯ АПЛА́ТА ПРА́ЦЫ**, разнавіднасць здзельнай формы *заработнай платы*, калі аб'ём работы загадзя агавораны ў пагадненні, а аплата ажыццяўляецца за поўнае выкананне гэтага аб'ёму.

**АКО́СТА** (Acosta), да Коста (da Costa) Урыэль (каля 1585, Партугалія — 1640), нідэрландскі мысліцель-вальнадумец. Нарадзіўся ў яўр. сям'і, якая прыняла каталіцызм. У 1614 уцёк у Нідэрланды, перайшоў ва іудаізм. За крытыку догмаў іудаізму, пропаведзь «натуральнай рэлігіі» двойчы адлучаны ад сінагогі, яго кн. «Выпрабаванне фарысейскіх традыцый у параўнанні з пісаным законам» (1624) публічна спалена. Аўтар твораў «Тэзісы супраць традыцыі», «Пра смяротнасць душы чалавечай» (1623), «Прыклад чалавечага жыцця» і інш. А. крытыкаваў тлумачэнне рабінамі веравучэння Майсея, адмаўляў бессмяротнасць душы і замагільнае жыццё, гал. прынцыпамі чалавечага жыцця абвяшчаў розум і любоў да бліжняга. Скончыў жыццё самагубствам. Погляды А. паўплывалі на развіццё вальнадумства ў Зах. Еўропе, на ідэйную эвалюцыю Б.*Спінозы*.

*Г.У.Грушавы.*

**АКР** (англ. acre), адзінка зямельнай плошчы ў краінах, якія карыстаюцца англ. сістэмай мер (Вялікабрытанія, ЗША, Канада, Аўстралія і інш.). 1 А. = = 4840 кв. ярдам = 4046,86 м$^2$.

**АКРА...** (ад грэч. akros крайні, самы аддалены, высокі), састаўная частка складаных слоў, якая абазначае: 1) «які адносіцца да канечнасцяў, органаў, частак цела»; 2) «які адносіцца да вяршыні», «верхні», напр., *акраверш, акрасома*.

**А́КРА** (Accra), горад, сталіца *Ганы*, порт у Гвінейскім заліве. Засн. ў 16 ст. 970 тыс. ж. (1990). Міжнар. аэрапорт. Вузел чыгунак і шашэйных дарог. Гандл.-прамысл. і культ. цэнтр. Металаапр., механазборныя, тэкст., лесапільныя, будматэрыялаў, харч. прадпрыемствы; з-д эл.-абсталявання. Саматужная вытв-сць вырабаў з золата і серабра. Рынак алмазаў і какава-зярнят. Акадэмія навук. Ун-т. Нац. музей. Еўрап. форты 17 ст.

**АКРАБАЛІ́СТЫ** (ад грэч. akrobolistēs стралкі), воіны лёгкай конніцы ў Стараж. Грэцыі ў 6—4 ст. да н.э., узброеныя дроцікамі і лукамі. Звычайна вялі разведку, пачыналі бітву, гналіся за праціўнікам, які адступаў.

**АКРАБА́ТЫКА** (ад грэч. akrobatēs які падымаецца ўверх), 1) від спорту (спартыўная акрабатыка). Уключае шматлікія фіз. практыкаванні (вылучаюць 2 асн. групы: скачковая А. і сілавая — стойкі, піраміды і інш.). Удзельнічаюць мужчыны і жанчыны паасобку, з партнёрам (у т.л. мяшаныя пары), групай. Часам выкарыстоўваюць спец. прылады (трамплін, батут). Чэмпіянаты свету па А. праводзяцца з 1964. На Беларусі гурткі А. існавалі з сярэдзіны 1930-х г., як спорт развіваецца з 1946. Сярод бел. акрабатаў чэмпіёны свету і Еўропы Ю.Зікуноў (1974), В.*Біндлер*, чэмпіёны СССР А.Колесава (1952), В.Бірукоў (1957), А. і М. Туманавы (1963), Л.Зданюк (1966—67), А.Базылеў (1974). 2) Від фіз. практыкаванняў накшталт гімнастычных. Шырока выкарыстоўваецца ў розных відах спорту (спарт. гімнастыка, скачкі ў ваду, фрыстайл і інш.), а таксама пры спец. фіз. падрыхтоўцы лётчыкаў і касманаўтаў. 3) Жанр цыркавога і эстраднага мастацтва, гл. *Акрабатычнае мастацтва*.

**АКРАБАТЫ́ЧНАЕ МАСТА́ЦТВА**, акрабатыка, жанр цыркавога і эстраднага мастацтва; дэманстраванне нумароў, заснаваных на майстэрскім валоданні целам і высокім развіцці мускулатуры.

Са старажытнасці вядома ў Егіпце, Грэцыі, Рыме, Візантыі, Кітаі, Японіі. У сярэднія вякі элементы акрабатыкі ўключалі ў свае выступленні вандроўныя акцёры: шпільманы (Германія), жанглёры (Францыя), мімы (Італія), франты (Польшча), скамарохі (Беларусь і Расія) і інш. Як род цыркавога відовішча А.м. вылучылася ў канцы 18—19 ст. (конная, партэрная акрабатыка).

У сучасным цырку А.м. падзяляецца на скачковае (на зямлі), плечавое, сілавое, пластычнае, коннае, ікарыйскія гульні, вальтыжыроўку, камічнае. Элементы А.м. выкарыстоўваюць амаль ва ўсіх інш. жанрах — паветранай гімнастыцы, эквілібрыстыцы, гімнастыцы на снарадах, жангліраванні, клаунадзе, дрэсіроўцы, а таксама ў харэагр. мастацтве, тэатр. і эстрадных паказах, у т.л. ў пантаміме і поп-групах.

**АКРАВЕ́РШ** (ад *акра...* + *верш*), верш, у якім рытмічная выразнасць дапаўняецца зрокавай: першыя літары радкоў (радзей склады або словы) утвараюць слова ці нават фразу (звычайна імя аўтара або адрасата). Развіўся з магічных тэкстаў і стаў папулярны ў эпоху сярэднявечча і барока. Першыя ва ўсх.-слав. паэзіі А. стварыў Ф.Скарына ў «Малой падарожнай кніжцы» (1522). У сучаснай паэзіі сустракаецца таксама А. з апошніх літар радкоў (тэлеверш) і сярэдніх (мезаверш), якія могуць утвараць больш складаныя фігуры.

Да арт. **Акрабатыка.** Трэніроўка спартсменаў.



Да арт. **Акрабатычнае мастацтва.** Партэрны палёт.

**АКРАДЭРМАТЫ́Т** [ад *акра...* + *дэрматыт*(ы)], група хвароб з выключным або пераважным пашкоджаннем скуры канечнасцяў. Атрафічны хранічны А. бывае часцей у жанчын. На скуры тыльнага боку кісці і ступні, каленных і локцевых суставаў з'яўляецца застойна-сінюшная эрытэма, якая паступова распаўсюджваецца па ўсёй канечнасці. Скура атрафіруецца, станчаецца, робіцца падобнай на папяросную паперу. Суб'ектыўныя адчуванні адсутнічаюць, зрэдку — паколванні, неўралгічныя болі. Іншы раз бываюць зацвярдзенні скуры, вузлы каля каленных і локцевых суставаў, трафічныя язвы. Пры пустулёзным А. скура далоняў і тыльных паверхняў пальцаў рук (часцей вакол пазногцяў і каля падушачак), радзей скура пальцаў ног робіцца сінюшна-чырвоная, нацягнутая, бліскучая, пачынае лушчыцца (эрытэматозна-лушчыльная форма), з'яўляюцца пухіры (везікулёзная форма), часцей паверхневыя гнайнікі (пустулёзная форма). Скура паступова станчаецца, атрафіруецца, пазногці мутнеюць, дэфармуюцца і адпадаюць. Працэс можа пашырыцца на скуру далоняў, падэшвы, іншы раз — на ўсё цела. Суб'ектыўна — паколванні, радзей неўралгічныя болі. Захворванне пачынаецца з кароткімі рэмісіямі. Энтэрапатычны А. развіваецца часцей у немаўлят і дзяцей ранняга ўзросту. Абумоўлены спадчыннасцю, парушэннямі ўсмоктвання пажыўных рэчываў і цынку ў тонкіх кішках. Характарызуецца пухірковай, гнайнічковай высыпкай вакол рота, вачэй, задняга праходу, у вобласці локцяў, каленяў, пахвінна-сцегнавых складак, на сцёгнах, ягадзіцах, дзе потым утвараюцца бляшкі. Адначасова пашкоджваецца слізістая абалонка рота, пазногці мутнеюць, робяцца ломкія, выпадаюць валасы на галаве, брывах, вейках. Характэрны святлабоязь, блефараспазма, страўнікава-кішачныя расстройствы, якія прыводзяць да знясілення і адставання ў фіз. развіцці дзіцяці.

*М.З.Ягоўдзік.*



Акратэрыі.



Афінскі акропаль. Рэканструкцыя.

**АКРАМЕГА́ЛІЯ** (ад *акра...* + *мегала...*), хвароба, якая характарызуецца празмерным ростам рук, ступняў і асабліва касцей твару, што прыводзіць да развіцця масіўнай ніжняй сківіцы і цяжкіх надброўяў. Выклікаецца залішняй сакрэцыяй гармону росту (самататрапіну) пры ацыдафільнай пухліне гіпофіза. Лішкі самататрапіну выклікаюць таксама гіпафізарны дыябет, абумоўлены тармажэннем сакрэцыі інсуліну. А. назіраецца ў маладым узросце, развіваецца паступова, доўгія гады. Суправаджаецца болем галавы, палавой слабасцю, спыненнем менструацый, парушэннем зроку. Лячэнне: рэнтгенаўскае апрамяненне, хірург. выдаленне пухліны.

**А́КРАН** (Akron), горад на ПнУ ЗША, у штаце Агайо. 227 тыс. ж., з прыгарадамі 650 тыс. ж. (1990). Трансп. вузел. Сусветны цэнтр гумавай прам-сці. Металаапр., маш.-буд. (станкі, аўтамабілі, дарожна-буд. машыны, падшыпнікі, ракетныя рухавікі, сілавыя ўстаноўкі да атамных падводных лодак), хім. (сінт. каўчук, смала і інш.), шынная, паліграф. прам-сць. Ун-т.

**АКРАСО́МА** (ад *акра...* + грэч. sōma цела), апікальнае цельца, перфараторый, утварэнне на верхняй частцы галоўкі сперматазоіда. Пры апладненні ў момант сутыкнення сперматазоіда з яйцаклеткай ферменты А. растваряюць абалонку яйцаклеткі і забяспечваюць яго пранікненне ўнутр.

**АКРАТЭ́РЫЙ** (ад грэч. akrotērion вяршыня, франтон), скульптурны элемент арх. дэкору, які завяршае вуглы франтонаў арх. збудавання, створанага з выкарыстаннем класічнага *ордэра*. Узнік у антычнасці, у розныя эпохі набываў своеасаблівую трактоўку: квіятон (готыка), пальмета (рэнесанс), валюта, арнаментальная кампазіцыя (барока), абеліск, статуя, грыфон, ваен. атрыбуты (класіцызм) і інш.

**АКРО́ПАЛЬ** (грэч. akropolis ад *акра...* + polis горад), узвышаная ўмацаваная частка стараж.-грэч. горада, т. зв. верхні горад; месца першапач. паселішча, вакол якога пазней развіўся т. зв. ніжні горад. Служыў сховішчам для жыхароў акругі ў час войнаў. На А. звычайна знаходзіліся храмы багоў — заступнікаў горада. У руінах шэрагу А. знойдзены шматлікія помнікі матэр. культуры. Найб. вядомы *Афінскі акропаль*, дзе захаваліся шэдэўры стараж. архітэктуры і скульптуры.

**АКРУ́ГА**, падзел дзярж. тэрыторыі па адм. ці паліт. прыкметах. 1) Адм.-тэр. адзінка ў БССР у 1924—30 і 1935—38. 2) Спец. адм.-тэр. адзінка галіновага кіравання (ваен. А., навучальная А., пагранічная А., судовая А. і інш.). 3) У Зах. Беларусі — раён дзейнасці падп.

акруговых к-таў КПЗБ і КСМЗБ. 4) Часовыя тэр. ўтварэнні для правядзення выбарчых кампаній.

**АКРУ́ГА ВАЕ́ННАЯ**, гл. *Ваенная акруга.*

**АКРУГЛЕ́ННЕ** ліку, набліжанае выяўленне ліку з дапамогай канечнай колькасці лічбаў. Пры А. з недахопам апошняя пакінутая лічба не мяняецца, пры А. з лішкам — павялічваецца на адзінку. Праводзіцца паступова справа налева паводле правіла: калі адкінутая лічба $a \le 4$ або калі $a = 5$ і апошняя пакінутая лічба цотная, то акругляюць з недахопам, у астатніх выпадках — з лішкам. Адрозніваюць А. да пэўнага ліку дзесятковых знакаў, калі загадзя ўказваецца нумар апошняга разраду, і А. да пэўнага ліку вартасных лічбаў, напр., А. ліку 78,6741 да першага дзесятковага знака дае лік 78,7, да другога — 78,67, да дзвюх вартасных лічбаў — 79.

**АКРУ́ЖНАСЦЬ**, замкнёная плоская крывая, усе пункты якой знаходзяцца ад яе цэнтра О на аднолькавай адлегласці, роўнай радыусу R (гл. рыс.). Прамая АВ, што злучае 2 пункты А., наз. яе хордай, хорда СД, што праходзіць праз цэнтр О, — дыяметрам. Адносіны даўжыні А. да яе дыяметра выражаюцца лікам $\pi = 3{,}1415....$ Даўжыня А. роўная $2\pi R$. Гл. таксама *Круг.*

**АКРУЖНА́Я** Святлана Арцёмаўна (н. 26.1.1947, г. Чарнаўцы, Украіна), бел. актрыса. Нар. арт. Беларусі (1991). Скончыла Бел. тэатр.-маст. ін-т (1969). Працуе ў Бел. т-ры імя Я.Коласа. Выконвае ролі лірыка-драматычныя, востракамедыйныя, характарныя: Дачка («Зацюканы апостал» А.Макаёнка), Люська («Радавыя» А.Дударава), Анютка («Улада цемры» Л.Талстога), Галя Чацвяртак («А зоры тут ціхія» паводле Б.Васільева), Катрын («Матухна Кураж і яе дзеці» Б.Брэхта), Люсі Мерыкур («Будзьце здаровы!» П.Шэно), Франка («Хам» паводле Э.Ажэшкі) і інш.

**АКРУЖЭ́ННЕ** (ваен.), ізаляцыя групоўкі праціўніка ад астатніх яго войскаў з мэтай знішчэння ці ўзяцця ў палон. Паспяховае А. часцей бывае, калі прарыў абароны праціўніка ажыццяўляецца на двух або некалькіх участках фронту з развіццём *наступлення* па напрамках, якія сыходзяцца; калі створана перавага над праціўнікам у сілах і сродках (пры спрыяльных умовах А. магчыма і пры роўных сілах). Акружаная групоўка адначасова блакіруецца з паветра, а на прыморскіх напрамках і з боку мора.

Класічны прыклад А. — бітва пры Канах у 216 да н.э. паміж рым. і карфагенскай арміямі. Шырока практыкавалася ў час Вял. Айч. вайны, калі сав. войскі правялі шэраг значных аперацый па А. войскаў праціўніка (гл. *Сталінградская бітва 1942—43, Корсунь-Шаўчэнкаўская аперацыя 1944, Яса-Кішынёўская аперацыя 1944*). На тэр. Беларусі ў ходзе *Віцебска-Аршанскай аперацыі 1944, Бабруйскай аперацыі 1944, Мінскай аперацыі 1944* трапілі ў А. вял. групоўкі ням. войскаў (гл. *Віцебскі «кацёл», Бабруйскі «кацёл», Мінскі «кацёл»*).

**А́КРЫ** (Acre), штат на Пн Бразіліі, у вярхоўях рэк Журуа і Пурус. Пл. 152,6 тыс. км². Нас. 412 тыс. чал. (1989). Адм. ц. — г. Рыу-Бранку. На тэр. А. вільготныя тропічныя лясы. Збор соку гевеі, браз. арэхаў. Паляванне. Спажывецкае земляробства.

**АКРЫ́ЛАВАЯ КІСЛАТА́**, найпрасцейшая арганічная ненасычаная кіслата, $CH_2{=}CH{-}COOH$. Бясколерная вадкасць з рэзкім пахам, $t_{кіп}$ 140,9 °С, шчыльн. $1{,}05{\cdot}10^3$ кг/м³, змешваецца з вадой, спіртамі, эфірамі. Аказвае каразійнае дзеянне, лёгка палімерызуецца (для працяглага захоўвання карыстаюцца інгібітарамі). Солі і эфіры А.к. наз. *акрылатамі.*

Атрымліваюць акісленнем прапілену: $CH_2{=}CH{-}CH_3 + O_2 \rightarrow CH_2{=}CH{-}COOH$. Выкарыстоўваюць у вытв-сці іонаабменных смолаў, каўчукоў, эфіраў (гл. *Поліакрылаты*). А.к.




**Акружнасць:**
*AB* — хорда;
*CD* — дыяметр;
*R* — радыус;
*O* — цэнтр акружнасці.

і яе солі дабаўляюць у друкарскія фарбы, пасты і інш.

**АКРЫ́ЛАВЫЯ ВАЛО́КНЫ**, гл. ў арт. *Поліакрыланітрыльныя валокны.*

**АКРЫ́ЛАВЫЯ КЛЕІ́**, поліакрылавыя клеі, сінтэтычныя *клеі* на аснове вытворных акрылавай, метакрылавай ці цыянакрылавай кіслот. Найб. пашыраны А.к. з манамерных эфіраў ці растворaў *поліакрылатаў* ва ўласных манамерах ці інертных арган. растваральніках. Некаторыя А.к. мадыфікуюць інш. манамерамі ці сінт. смоламі для надання ім спецыфічных уласцівасцяў (эластычнасці, тэрмаўстойлівасці, трываласці клеявых злучэнняў і інш.). Выкарыстоўваюцца для склейвання металаў, пластмасаў, драўніны, паперы, сілікатнага і арган. шкла (у т.л. аптычнага), цыянакрылатныя клеі — пры хірург. аперацыях. З А.к. вырабляюць ліпкія стужкі і пластыры.

**АКРЫ́ЛАВЫЯ ЛА́КІ**, поліакрылавыя лакі, растворы поліакрылатаў і іх вытворных у арган. растваральніках. Утвараюць святло-, атмасфера- і водаўстойлівыя пакрыцці з добрай адгезіяй да металу. Выкарыстоўваюць для аховы ад карозіі алюмінію і яго сплаваў; эмалевыя фарбы на іх аснове — у авіяц. і аўтамаб. прам-сці, вытв-сці буд. канструкцый і інш.

**АКРЫЛАМІ́Д**, арганічнае злучэнне, вытворнае *акрылавай кіслаты*, $CH_2{=}CH{-}CONH_2$. Мал. м. 71,07. Бясколерныя крышталі, $t_{пл}$ 84,5 °С. Растваральны ў вадзе, метаноле, ацэтоне.

Атрымліваюць з акрыланітрылу: $CH_2{=}CH{-}CN\ H_2O \rightarrow CH{=}CH{-}CONH_2$. Манамер для атрымання поліакрыламіду і яго супалімераў, мадыфікатар гумавых сумесяў. Раздражняе слізістыя абалонкі (ГДК у вадзе 0,2 мг/м³).

С.А.Акружная.

**АКРЫЛА́Н**, гл. ў арт. *Поліакрыланітрыльныя валокны.*

**АКРЫЛАНІТРЫ́Л**, арганічнае злучэнне, вытворнае *акрылавай кіслаты*, $CH_2{=}CH{-}CN$. Мал. м. 53,03. Бясколерная вадкасць з характэрным пахам, $t_{кіп}$ 77,3 °С, шчыльн. $0{,}80{\cdot}10^3$ кг/м³. Растваральны ў вадзе і арган. растваральніках, палімерызуецца.

Атрымліваюць акісленнем сумесі прапілену і аміяку: $CH_2{=}CH{-}CH_3 + NH_3 + 3O \rightarrow 3H_2O + CH_2{=}CH{-}CN$. Выкарыстоўваюць у вытв-сці поліакрыланітрылу, валокнаў з яго, АБС-пластыку, бутадыен-нітрыльнага каўчуку і інш. супалімераў. Таксічны, сумесі з паветрам выбухованебяспечныя.

**АКРЫЛА́ТНЫЯ КАЎЧУКІ́**, сінтэтычныя каўчукі, супалімеры эфіраў *акрылавай кіслаты.* Звычайна гэта супалімеры бутылакрылату з акрыланітрылам ці β-хлорэтылвінілавым эфірам акрылавай к-ты, якія атрымліваюць эмульсійнай супалімерызацыяй. Растваральныя ў вуглевадародах, няўстойлівыя да спіртоў і гліколяў і пры награванні ў вільготным асяроддзі. Вулканізуюцца амінамі ў спалучэнні з серай ці фенола-фармальдэгіднымі смоламі. Атрыманая гума масла-, бензіна-, цепла-, святло-, і азонаўстойлівая, газанепранікальная. Выкарыстоўваецца ў вытв-сці цепла- і масластойкіх гумава-тэхн. вырабаў, рамянёў, стужак для транспарцёраў, клеяў, лакафарбавых матэрыялаў, для абкладкі цыстэрнаў, бензабакаў, на ізаляцыю.

**АКРЫЛА́ТЫ**, вытворныя *акрылавай кіслаты*, складаныя эфіры ці яе солі. А. (эфіры) — бясколерныя вадкасці (напр., метылакрылат $CH_2{=}CH{-}COOCH_3$, $t_{кіп}$ 80 °С). А. (солі) — крышт. рэчывы. Лёгка палімерызуюцца пры дзеянні святла, цяпла, кіслароду і пераксідаў (захоўваюцца з інгібітарамі).

У прам-сці А. метылавага і этылавага спіртоў атрымліваюць з этыленцыянгідрыну і адпаведнага спірту: $2CH_2OHCH_2CN + 2ROH + H_2SO_4 \rightarrow CH_2{=}CHCOOR +$

+ $(NH_4)_2SO_4$, вышэйшых спіртоў — рэакцыяй *пераэтэрыфікацыі*, а солі — *нейтралізацыяй* акрылавай к-ты. Выкарыстоўваюцца ў выт-сці палімераў, каўчукоў, як дабаўкі ў друкарскіх фарбах, лаках.

**АКРЫ́ТЫ**, вольныя сяляне-воіны ва ўсх. раёнах Візантыі. У 14 ст. абаранялі межы дзяржавы ад арабаў і туркаў-сельджукаў.

**АКРЭДЫТАВА́ННЕ** (ад лац. accredere давяраць), у міжнар. праве працэс прызначэння і ўступлення на пост дыпламат. прадстаўніка пры ўрадзе інш. дзяржавы або пастаяннага прадстаўніка дзяржавы пры міжнар. арг-цыі. Пачаткам А. з'яўляецца *агрэман*, завяршэннем — уручэнне акрэдытаваным (прызначаным) *даверчай граматы*.

**АКРЭДЫТЫ́Ў**, разліковы ці грашовы дакумент у выглядзе даручэння аднаго банка другому зрабіць аплату за адгружаны тавар, выкананыя работы (паслугі) ці выдаць прад'яўніку А. пэўную суму грошай пры выкананні пэўных умоў.

Бываюць А.: г р а ш о в ы — імянны дакумент, што выдаецца банкам асобе, якая ўнесла пэўную суму і жадае атрымаць яе цалкам ці часткамі ў інш. горадзе на працягу агаворанага часу; т а в а р н ы — форма *безнаяўных разлікаў*, пры якой разліковыя дакументы аплачваюцца плацельшчыкам на месцы знаходжання пастаўшчыка за кошт сродкаў, спецыяльна забраніраваных у банку аплачваемым бокам, ці аплата гэтых дакументаў гарантавана банкам; а д з ы ў н ы — можа быць ануляваны банкам, што яго адкрыў; б е з а д з ы ў н ы — з'яўляецца цвёрдым абавязацельствам банка-эмітэнта; п а ц в е р д ж а н ы — гарантаваны банкам, які яго адкрыў; н е п а ц в е р д ж а н ы — без гарантый банка; р э в а л ь в е р н ы — па меры выкарыстання аўтаматычна папаўняецца ў межах устаноўленай агульнай сумы ліміту і тэрміну дзеяння; п е р а в о д н ы — цалкам ці часткова можа быць выкарыстаны інш. асобамі. *Г.І.Краўцова.*

**АКРЭ́ЙЦ** Станіслаў Станіслававіч (літ. псеўданім А р л і ц к і; 25.8.1836, г. Арол ?, Расія — пасля 1918), бел. і рус. журналіст, мемуарыст, белетрыст. Скончыў Віцебскую гімназію (1856), быў вольным слухачом Горы-Горацкага земляробчага ін-та. Служыў у Магілёве ў палаце дзярж. маёмасцяў, уваходзіў у гурток перадавой моладзі. Дасылаў заметкі ў пецярб. час. «Искра» і «Экономический указатель». Рэдакцыя «Современника» ўхваліла яго праект выдання ў Магілёве час. «Белорусский вестник» (не выходзіў). Удзельнік паўстання 1863—64. З 1868 у Пецярбургу. Выдаваў час. «Дешевая библиотека», «Всемирный труд», «Луч» і інш. У рамане «Апошнія язычнікі» (1871—72), кн. «Старасвецкія памешчыкі. Нарысы Заходняга краю» (1885), мемуарах расказвае пра Беларусь 1850—60-х г., паўстанне 1863—64.

**АКРЭ́СЛЕНЫЯ ФІГУ́РЫ**, гл. ў арт. *Умежаваныя і акрэсленыя фігуры*.

**АКРЭ́ЦЫЯ** (ад лац. accretio прырошчванне), павелічэнне памераў прыроднага цела за кошт паступлення рэчыва на яго паверхню. Адрозніваюць А.: планеты (канасалідацыя часцінак протапланетнага воблака ў масіўнае цела планеты), кантынента (разрастанне кантынента за кошт далучэння новых блокаў з кантынентальнай карой — тэрэйнаў або пераўтварэння акіянскай кары ў кантынентальную), літагенетычную (рост мінер. новаўтварэнняў з паверхні утварэнне *канкрэцый*), вулканічную (канасалідацыя лавы вакол зацвярдзелага ядра) і інш. *М.А.Нагорны.*

**АКСА́К** (сапр. А р л о в а) Валянціна Іванаўна (н. 28.4.1953, в. Смалічы Нясвіжскага р-на Мінскай вобл.), бел. паэтэса. Скончыла БДУ (1975). Настаўнічала, працавала журналісткаю. З 1992 у час. «Беларусь». Друкуецца з 1987. Аўтар зб-каў вершаў «Цвінтар» (1992), «Капліца» (1994). У лірыцы побач з інш. распрацоўвае хрысціянскія матывы і вобразы.

Аксалотль.

Аксаміт кітайскі.

**АКСАКА́Л** (цюрк. літар. белая барада), у цюркскіх народаў пры першабытнаабшчынным ладзе галава роду, старэйшына; з развіццём феадалізму — прадстаўнік патрыярхальна-феад. знаці. Пазней А. — выбарны староста, паважаны чалавек.

**АКСА́КАЎ** Іван Сяргеевіч (8.10.1823, с. Надзеждзіна Уфімскай губ. — 8.2.1886), расійскі паэт і публіцыст, адзін з кіраўнікоў *славянафілаў*. Сын С.Ц.*Аксакава*. Скончыў Пецярбургскае вучылішча правазнаўства (1842). У 1840—60-я г. выступаў за адмену прыгоннага права і цялесных пакаранняў. Рэдагаваў славянафільскія час. і газ. «Русская беседа», «День», «Москва», «Русь» і інш. У 1858—78 адзін з кіраўнікоў маскоўскага Слав. к-та. У рус.-тур. вайну 1877—78 арганізаваў кампанію ў падтрымку паўд. славян. Прытрымліваўся манархічных вялікадзярж. поглядаў, у т.л. адмаўляў этн. самастойнасць беларусаў, прапагандаваў ідэі *панславізму*. Аўтар вершаў, паэмы «Бадзяга» (1852) пра трагічны лёс прыгоннага селяніна.

**АКСА́КАЎ** Канстанцін Сяргеевіч (10.4.1817, с. Новаксакава Арэнбургскай губ. — 19.12.1860), расійскі гісторык, філолаг, паэт і публіцыст, адзін з ідэолагаў *славянафілаў*. Сын С.Ц.*Аксакава*. Скончыў Маскоўскі ун-т (1835). Гал. асаблівасць Расіі бачыў у абшчынным ладзе, гарманічным суіснаванні дзвюх рухаючых сіл гісторыі — народа («зямлі») і дзяржавы («улады»), парушаных рэформамі Пятра I. Выступаў за адмену прыгоннага права і за ліберальныя пераўтварэнні. Яго вершы («Вяртанне», «Пятру», «Масква», «Свабоднае слова») і п'есы [«Вызваленне Масквы ў 1612 годзе» (1848), «Алег каля Канстанцінопаля» (1858)] прасякнуты рамантычна-славянафільскім духам. Выступаў супраць крытычнага кірунку ў рус. л-ры. Даследаваў нац. асаблівасці грамат. ладу рус. мовы.

**АКСА́КАЎ** Сяргей Сяргеевіч (7.1.1891, г. Самара — 4.9.1968), бел. кампазітар. Скончыў Аляксандраўскі ліцэй у С.-Пецярбургу (1914). Музыцы вучыўся ў К.Ігумнава, А.Грачанінава, Ю.Энгеля. Працаваў у Полацку, Пскове, Самары, Харбіне, Шанхаі. З 1955 у Мінску, выкладаў у Сярэдняй спец. муз. школе пры Бел. кансерваторыі. У праграмных інстр. творах увасобіў карціны бел. прыроды і побыту, сюжэты і вобразы нац. л-ры: сімф. паэмы «У Тураўскай пушчы» паводле верша У.Дубоўкі і «Лясная казка» па матывах твораў Я.Коласа, канцэртная увертюра «Сельскае свята» і балада для сімф. аркестра; фантазія для фп. з арк. «Над Нёманам», рамансы і хары на словы бел. паэтаў. З інш. тв.: кантата «Памяці Пушкіна»; сімфонія, канцэрт для фп. з арк., інстр. п'есы.

**АКСА́КАЎ** Сяргей Цімафеевіч (1.10.1791, г. Уфа — 12.5.1859), рускі пісьменнік. Вучыўся ў Казанскім ун-це (1805—07). Чл.-кар. Пецярбургскай АН (з 1856). З 1843 жыў у маёнтку *Абрамцава*. Літ. дзейнасць пачаў у 1820-я г. як тэатр. рэцэнзент. Першы маст. нарыс «Буран» (1834). У кн. «Запіскі пра тое, як вудзіць рыбу» (1847), «Запіскі ружэйнага паляўнічага Арэнбургскай губерні» (1852), «Апавяданні і ўспаміны паляўнічага пра розныя паляванні» (1855) выступіў як уважлівы назіральнік паводзін, звычак звяроў, птушак і рыб. Вяршыня творчасці — аўтабіягр. аповесці «Сямейная хроніка» (1856) і «Дзіцячыя гады Багрова-ўнука» (1858), у якіх стварыў шырокую панараму памешчыцкага побыту канца 18 ст. Пісаў артыкулы, рэцэнзіі, нататкі пра л-ру і тэатр, мемуары («Літаратурныя і тэатральныя успаміны», 1856—58, «Гісторыя майго знаёмства з Гогалем», 1852—55, незаконч.; апубл. 1890) і інш.

*Тв.*: Собр. соч. Т. 1—3. М., 1986.

**АКСАЛА́ТНАЯ КІСЛАТА́**, гл. *Шчаўевая кіслата*.

**АКСАЛА́ТЫ**, вытворныя *шчаўевай кіслаты*, складаныя эфіры ці яе солі. А. (эфіры) — вадкасці (напр., дыэтылаксалат $C_2H_5OOC—COOC_2H_5$, $t_{кіп}$ 185,4 °С), растваральныя ў спіртах, эфірах, нерастваральныя ў вадзе. Атрымліваюць этэрыфікацыяй шчаўевай к-ты адпаведным спіртам. Выкарыстоўваюць як растваральнікі прыродных і сінт. смолаў, вытворных цэлюлозы. А. (солі) — крышт. рэчывы, раскладаюцца без плаўлення, дрэнна растваряюцца ў вадзе. Пашыраны ў прыродзе: водарасці, грыбы, лішайнікі, папараці маюць у саставе А. кальцыю; мінералы — А. жалеза. Выкарыстоўваюцца як рэагенты ў аналітычнай хіміі, як праяўляльнікі ў фатаграфіі і інш. Утварэнне А. кальцыю ў арганізме чалавека — прычына ўзнікнення ныракна- і жоўцекамянёвай хваробы.

**АКСАЛО́ТЛЬ** (ацтэкскае літар. вадзяная цацка), лічынка тыграваў *амбістомы*. Жыве ў вадаёмах Цэнтр. Амерыкі.

Даўж. 20—25 см. Здольная да размнажэння (гл. *Неатэнія*). Мае шчэлепы. Да сярэдзіны 19 ст. лічыўся самастойным відам (упершыню ператварэнне ў амбістому назіралі ў 1865). Страта здольнасці А. да нармальнага ператварэння — вынік недастатковага развіцця шчытападобнай залозы; дабаўленне ў ежу або ін'екцыя гармона гэтай залозы прыводзіць да ператварэння А. ў амбістому. Кладзе да 500 яец. Выкарыстоўваецца для доследаў у біялогіі.

**АКСАМІ́Т**, аксамітнае дрэва (Phellodendron), род дрэў сям. рутавых. Вядома 10 відаў, пашыраных ва Усх. Азіі. Найб. вядомы А. амурскі (P. amurense), А. кітайскі (P. chinense), А. японскі (P. japonicum). На Беларусі ў канцы 19 — пач. 20 ст. інтрадукаваны А. амурскі, або амурскае коркавае дрэва. З 1930—40-х г. уводзіцца ў ляснyя культуры. Прыдатны для вырошчвання на Беларусі, акрамя паўн. раёнаў.

Вып. 20—30 м. Ствол таўшчынёй да 80 см, укрыты слоем корку (да 7 см), які можна час ад часу здымаць. Лісце супраціўнае, чаранковае, няпарнаперыстае. Кветкі жоўта-зялёныя, дыям. да 1 см. Плады — чорныя мясістыя ягадападобныя касцянкі з непрыемным пахам. Размнажаецца насеннем і чаранкамі. Меданос. Выкарыстоўваецца на прамысл. мэты (корак, фарба, таніды, каштоўная драўніна) і як дэкар. расліна.

**АКСАМІ́ТАЎ** Анатоль Сцяпанавіч (н. 17.7.1926, Гомель), бел. моваznавец. Д-р філал. н. (1984). Скончыў БДУ (1951). У 1952—91 у Ін-це моваznаўства АН Беларусі, з 1994 у Фондзе фундаментальных даследаванняў Рэспублікі Беларусь. Распрацоўвае пытанні бел. і слав. фразеалогіі («Лексіка беларускіх прыказак XIX ст. ў сувязі з агульнай праблемай фразеалогіі», 1958; «Беларуская фразеалогія», 1978; «Гістарычная лексікалогія беларускай мовы», 1970, у сааўт.), этналінгвістыкі, фразеаграфіі і гісторыі бел. моваznаўства. Рэдактар і адзін са складальнікаў «Фразеалагічнага слоўніка мовы твораў Я.Коласа» (1993), сааўт. «Беларуска-рускага слоўніка» (1962). Аўтар кн. «З думай славяніна» (1991, з Л.А.Малаш).

**АКСАМІ́ТКІ**, тагетэс (Tagetes), род адна- і шматгадовых травяністых раслін сям. астравых. Каля 35 відаў, пашыраных у субтропіках Амерыкі. На Беларусі інтрадукаваны А. прамастойныя (T. erectus), А. адхіленыя (T. patula) і А. танкалістыя, або пасечаныя (T. tenuifolia); выкарыстоўваюцца ў кветкаводстве.

Выш. да 1,5 м. Сцябло прамастойнае, галінастае. Лісце перыста-рассечанае. Кветкі жоўтыя, жоўта-аранжавыя або карычнева-чорныя, у кошыках, з моцным пахам. Плод — сямянка. Размнажаюцца насеннем. Святла- і цеплалюбныя. Дэкар. і лек. расліны (мачагонны, патагонны і процітлісны сродак).

**АКСАМІ́ТНАЕ ДРЭ́ВА**, гл. *Аксаміт*.

**АКСАМІ́ТНАЯ КНІ́ГА**, радаслоўная кніга найб. знатных баярскіх і дваранскіх радоў Расіі. Складзена ў 1687. Назва па аксамітнай вокладцы. У А.к. ўвайшоў «Гасударaў радасловец» 1555—56, у якім вяліся радаслоўныя запісы Рурыкавічаў і Гедзімінавічаў. А.к. не закончана, у ёй ёсць недакладнасці, фальсіфікацыі. Маніфестам 1807 уведзена А.к. і купецкіх радоў першай гільдыі.

**«АКСАМІ́ТНАЯ РЭВАЛЮ́ЦЫЯ» 1989** у Чэхаславакіі, умоўная назва працэсу пераходу ад камуніст. ладу, што існаваў з 1948, да дэмакр. праўлення. Адбылася ў ліст.—снеж. ў мяккай, спакойнай форме (адсюль і назва). Масавыя выступленні 17—26 ліст. працоўных, студэнтаў за ўстанаўленне дэмакратыі і палітычнага плюралізму ўзначалілі апазіц. рухі *Грамадзянскі форум* на чале з В.*Гавелам* і Грамадскасць супраць насілля. Камуністы вымушаны былі пайсці на перагаворы з апазіцыяй. У выніку ўлада перайшла да прадстаўнікоў апазіцыі. Нац. сход выключыў з канстытуцыі краіны артыкулы аб кіруючай ролі камуніст. партыі і марксісцка-ленінскай ідэалогіі. У снеж. 1989 прэзідэнтам краіны абраны Гавел, старшынёй нац. сходу — А.*Дубчак*,

Аксаміткі прамастойныя.

Аксамітнік адкінуты.

сфарміраваны ўрад нац. адзінства на чале з М.Чалфам. Парламенцкія выбары ў чэрв. 1990 замацавалі перамогу дэмакр. сіл. *А.А.Чалядзінскі.*

**АКСАМІ́ТНІК**, амарант (Amaranthus), род пераважна аднагадовых травяністых раслін сям. аксамітнікавых. Каля 80 відаў, пашыраных у цёплых і ўмераных абласцях зямнога шара. На Беларусі 8 заносных і 1 інтрадукаваны від — А. трохкаляровы (A. tricolor), радзіма — трапічная Азія. Найб. вядомыя А. сіняваты (A. lividus, нар. назвы зяльборнік), А. адкінуты (A. retroflexus, нар. назва падбурачнік), А. жміндападобны (A. blitoides). Многія А. — дэкар. расліны. Растуць таксама як пустазелле.

Выш. 10—150 см. Лісце чаргаванае. Кветкі зялёныя або пурпурова-чырвоныя. Плод — каробачка. Насенне дробнае, бліскучае.

**АКСАМІ́ТНІЦЫ**, сатыры, вочкі (Satyridae), сямейства насякомых атр. лускакрылых, або дзённых матылёў. Касмапаліты. У сусв. фауне каля 2 тыс. відаў. У трапічных лясах Паўд. Амерыкі жывуць своеасаблівыя А. калітэры (Callitaera). На Беларусі 21. Найб. пашыраны *сенніца*, малы лясны сатыр (Hipparchia alcyone), матыль мяцёлчаты (Lasiommata maera).

Дзённыя матылі сярэдніх і буйных памераў. Крылы ў размаху да 10 см, часта шырокія, цёмнаафарбаваныя, з невял. вокападобнымі плямамі. Пярэднія ногі недаразвітыя. Вусені ўкрыты кароткімі валаскамі або голыя, верацёнападобныя, развіваюцца пераважна на дзікарослых злаках і пальмах. Вусені, зрэдку кукалкі, яйцы зімуюць з развітым зародкам; даюць часцей адно пакаленне за год.

**АКСАНАМЕ́ТРЫЯ** (ад грэч. ахбn вось + *...метрыя*), спосаб адлюстравання прасторавых фігур на чарцяжы пры дапамозе паралельных праекцый. Для пабудовы аксанаметрычнай праекцыі выбіраюць 3 узаемна перпендыкулярныя восі OX, OY, OZ і маштабы даўжыняў на гэтых восях; праецыруюць на плоскасць восі і дадзеную фігуру. Калі X, Y, Z — даўжыні 3 адрэзкаў у фігуры, то іх аксанаметрычныя праекцыі, паралельныя восям, будуць мець даўжыні x, y, z, пры гэтым $x/X=l_x$, $y/Y=l_y$, $z/Z=l_z$ наз. паказчыкамі скажэння. Найбольш выкарыстоўваецца А., пры якой $l_x : l_y : l_z = 1 : 1 : 1$ (ізаметрыя) і $l_x : l_y : l_z = 1/2 : 1 : 1$ (дыметрыя). У залежнасці ад вугла паміж напрамкам праецыравання і плоскасцю аксанаметрычных праекцый адрозніваюць прамавугольную і касавугольную А. Гл. таксама *Нарысоўная геаметрыя*. А. ў архітэктуры — адзін з відаў перспектыўнага адлюстравання. Выкарыстоўваецца ў арх. праектах і чарцяжах будынкаў, комплексаў, ансамбляў для нагляднага паказу іх структуры, асабліва ў выпадку, калі генпланы, планы, фасады і разрэзы не даюць поўнага ўяўлення пра іх арх.-прасторавую арганізацыю. Нярэдка А. агульнага выгляду пабудоў сумяшчаецца з іх арх. разрэзам, што ўдакладняе структуру ў цэлым.

**АКСЕЛЕРА́ТАР** (ад лац. accelerare паскараць) у тэхніцы, рэгулятар колькасці гаручай сумесі, што паступае з карбюратара ў цыліндры рухавіка ўнутр. згарання (у дызелях — паліва з помпы). Прызначаны для змены частаты вярчэння каленчатага вала рухавіка і адпаведна скорасці руху аўтамабіля, трактара і інш.

**АКСЕЛЕРА́ТАР** у эканоміцы, эканамічны паказчык, які характарызуе сувязь паміж аб'ёмам капіталаўкладанняў і велічынёй спажывецкіх выдаткаў у эканоміцы. Істотны рост спажывецкіх выдаткаў стымулюе інвестыцыйную актыўнасць і наадварот. А. разам з *мультыплікатарам* выкарыстоўваецца для выяўлення сутнасці і фактараў макраэканам. нестабільнасці пры дзярж. рэгуляванні рыначнай эканомікі. Прынцып А. прапанаваны ў 1913 А.*Афтальёнам* і ўключаны ў неакейнсіянскія мадэлі эканам. росту.



Аксаміты́цы: 1 — чарнушка-Медуза і яе вусень; 2 — калітэра.



Да арт. Аксанаметрыя: *а* — ізаметрыя; *б* — дыметрыя.

**АКСЕЛЕРА́ЦЫЯ**, акцэлерацыя, 1) у антрапалогіі і медыцыне — паскарэнне тэмпаў росту і развіцця дзяцей і падлеткаў у параўнанні з папярэднімі пакаленнямі. Назіраецца ў апошнія 100—150 гадоў часцей у эканамічна развітых краінах, сярод усіх сац. груп насельніцтва. Тэрмін увёў ням. вучоны Э.Кох (1935). У фіз. адносінах А. праяўляецца ў тым, што на кожным узроставым этапе сучасныя дзеці вышэйшыя і буйнейшыя за сваіх равеснікаў з мінулых гадоў. Напр., рост дзяцей пры нараджэнні павялічыўся ў сярэднім на 0,5—1 см, маса цела — на 100—800 г. Падваенне масы цела адбываецца ў 4—5 месяцаў, а не ў 5—6, як раней, змена малочных зубоў пастаяннымі не ў 6—7, а ў 5—6 гадоў. Паскорыліся тэрміны акасцянення шкілета, больш высокімі сталі паказчыкі фіз. развіцця. Канчатковых паказчыкаў росту дзяўчынкі дасягаюць да 16—17, юнакі — да 18—19 гадоў (раней адпаведна да 20—22 і 20—25 гадоў). На 1—2 гады раней адзначаецца палавая спеласць. Адзінай трактоўкі прычын А. не існуе. А. тлумачаць уплывам на арганізм фіз.-хім. фактараў (сонечнай і касм. радыяцыі, магнітнага поля і інш.), генет. тэорыяй цыклічных біяхім. змен, гетэрозісу, уплывам сац.-эканам. умоў жыцця. З 1980-х г. тэмпы А. пачалі замаруджвацца, аднак з'ява А. выклікае шэраг новых медыка-біял., сац., прававых і юрыд. задач. 2) Убіялогіі — паскарэнне фарміравання асобных частак зародкаў на пэўнай стадыі развіцця. Напр., ранняе развіццё ротавага апарата ў рыб і бясхвостых амфібій, якое забяспечвае ім жыўленне пасля вычэрпвання запасаў жаўтка ў яйцы.

**АКСЕЛЕРО́МЕТР** (ад лац. accelerare паскараць + *...метр*), прылада для вымярэння паскарэння руху машын, іх сістэм і звёнаў, вібрацыі машын і збудаванняў. Звычайна А. — маятнікавая прылада, у якой адхіленне маятніка (інерцыйнай масы) пад уплывам паскарэння машыны перадаецца на стрэлку градуіраванай шкалы. Бываюць мех., пнеўмат., эл. і інш. Лятальныя апараты (у т.л. ракеты) забяспечваюцца А. ў выглядзе гірамаятнікаў ці паплаўковых маятнікаў з аўтам. кампенсацыяй сіл трэння. А. рэлейнага тыпу выкарыстоўваюць для вызначэння найб. намагання пры штампоўцы, коўцы, забіванні паляў і інш. Найб. дакладныя ўжываюцца ў інерцыяльнай навігацыі.

**«АКСЕЛЬ ШПРЫ́НГЕР ФЕРЛА́Г АГ»** (Axel Springer Verlag AG), газетна-выдавецкі канцэрн у Германіі, самы буйны ў Зах. Еўропе. Засн. ў 1947 у Гамбургу А.Шпрынгерам. З 1970 акцыянернае т-ва. Выдае грамадска-паліт. і спецыялізаваныя газеты і часопісы. Мае навук. кніжнае выд-ва.

**АКСЕЛЬБА́НТ** (ням. Achselband), ніцяны плецены шнур (пазалочаны, пасярэбраны або каляровы) з метал. наканечнікамі. Прышпільваецца звычайна да правага (радзей левага) пляча пад пагонам (эпалетам). У арміях многіх замежных краін — прыналежнасць формы адзення ад'ютантаў, афіцэраў генштаба, жандараў і інш., а таксама асабовага складу некаторых часцей. Ва Узбр. Сілах Рэспублікі Беларусь — прыналежнасць парадная формы адзення ганаровай варты, удзельнікаў ваен. парадаў.

**АКСЕЛЬРО́Д** Зэлік Майсеевіч (30.12.1904, г. Маладзечна — 26.6.1941), яўр. паэт. Вучыўся ў Вышэйшым літ.-маст. ін-це імя Брусава (1922—25), скончыў Маскоўскі пед. ін-т (1928). З 1931 адказны сакратар час. «Штэрн» («Зорка»). У 1941 рэпрэсіраваны і расстраляны. Рэабілітаваны ў 1957. Друкаваўся з 1921. Аўтар паэт. зб-каў «Трапятанне» (1922), «Вершы» (1932), «Зноў вершы» (1935), «З вока на вока» (1937), «Чырвонаармейскія песні» (1939). Пераклаў на яўр. мову паэмы Я.Купалы «Бандароўна», П.Броўкі «Прамова фактамі», вершы Я.Купалы, А.Александровіча, Броўкі, М.Танка і інш.

**АКСЕЛЬРО́Д** (літ. псеўд. Ортодокс) Любоў Ісакаўна (1868 — 5.2.1946), расійскі філосаф і літаратуразнавец. Скончыла Бернскі ун-т (1900). З 1884 удзельнічала ў рэв. руху. У 1887 эмігравала ў Францыю, з 1892 прыхільнік марксісцкай групы «Вызваленне працы», паслядоўніца Г.В.Пляханава. У 1903 прымкнула да меншавікоў. Супрацоўнічала ў час. «Заря», у газ. «Искра». У 1906 вярнулася ў Расію. Распрацоўвала пытанні эстэтыкі, гісторыі філасофіі і гіст. матэрыялізму. Аўтар прац «У абарону дыялектычнага матэрыялізму. Супраць схаластыкі» (1928), «Ідэалістычная дыялектыка Гегеля і матэрыялістычная дыялектыка Маркса» (1934) і інш. Даследавала пытанні сацыялогіі мастацтва.

**А́КСЕР** (Axer) Эрвін (н. 1.1.1917, Вена), польскі рэжысёр. Скончыў Ін-т тэатр. мастацтва ў Варшаве (1939). Праф. Вышэйшай тэатр. школы ў Варшаве (1949). Працаваў у т-рах Львова і Лодзі. У 1949—81 дырэктар, маст. кіраўнік і рэжысёр Сучаснага т-ра (у 1955—57 адначасова ўзначальваў Нац. т-р) у Варшаве. Найб. ўвагу аддаваў пастаноўкам твораў нац. драматургіі: «Картачны домік» Э.Зегадловіча, «Трывожнае дзяжурства» Е.Лютоўскага, «Танга» С.Мрожака, «Кардыян» Ю.Славацкага. З інш. пастановак: «Дванаццатая ноч» У.Шэкспіра, «Тры сястры» А.Чэхава, «Мухі» Ж.П.Сартра, «Кар'ера Артура Уі» Б.Брэхта. Ставіў п'есы ў Дзюсельдорфе, Вене, Цюрыху, Мюнхене, Амстэрдаме, Нью-Йорку. Аўтар зб-каў «Лісты са сцэны» (т. 1—2, 1955—57), «Практыкаванні па памяці» (1984—92) і інш.

**АКСЕСУА́Р** (франц. accessoire), 1) прыналежнасць чаго-н.; пабочныя з'явы, дэталі, якія дапаўняюць гал. элемент *кампазіцыі*. 2) У тэатры — прадметы *бутафорыі* або рэквізіту. 3) У выяўленчым мастацтве — прадметы другараднага значэння, дапаможныя дэталі гал. выявы, якія паглыбляюць яе характарыстыку, часам нясуць сэнсавую і эмац. нагрузку, выконваюць функцыю, уласцівую атрыбуту ці сімвалу. У партрэце гэта дэталі інтэр'ера, касцюма, што дапаўняюць задуму аўтара твора.

**АКСЁНАЎ** Аляксандр Нічыпаравіч (н. 9.10.1924, в. Кунтараўка Веткаўскага р-на Гомельскай вобл.), дзярж. і парт. дзеяч БССР. Скончыў ВПШ пры ЦК КПСС (1957). З 1944 на камсамольскай рабоце ў Арэнбургскай, Баранавіцкай і Гродзенскай абл. З 1953 сакратар, 2-і, 1-ы сакратар ЦК ЛКСМБ. З 1957 сакратар ЦК ВЛКСМ. З 1959 нам. старшыні К-та дзярж. бяспекі пры СМ БССР, у 1960—65 міністр унутр. спраў БССР. З 1965 1-ы сакратар Віцебскага абкома КПБ. З 1971 2-і сакратар ЦК КПБ. З 1978 Старшыня СМ БССР. У 1983—85 Надзвычайны і Паўнамоцны пасол СССР у ПНР. У 1985—89 старшыня Дзярж. к-та СССР па тэлебачанні і радыёвяшчанні. Дэп. ВС БССР 1955—67, 1971—83, ВС СССР 1966—84, 1986—90, чл. Прэзідыума ВС БССР 1975—83.

**АКСЁНАЎ** Васіль Паўлавіч (н. 20.8.1932, Казань), рускі пісьменнік. Сын А.С.*Гінзбург*. Скончыў Ленінградскі мед. ін-т (1956). З 1980 жыве за мяжой. На пач. літ. творчасці перавагу аддаваў творам пра жыццё моладзі, напісаным у жанры т.зв. «спавядальнай» прозы — аповесць «Калегі» (1960, аднайм. фільм 1963), раман «Зорны білет» (1961), зб-кі «Катапульта» (1964), «На паўдарозе да Месяца» (1966). Аўтар сатыр.-фантаст. аповесці «Затавараная бачкатара» (1968), раманаў «Пошукі жанру» (1978), «Апёк» (1980), «Востраў Крым» (1981), кнігі пра Амерыку «У пошуках сумнага бэбі» (1986).

**АКСЁНАЎ** Уладзімір Віктаравіч (н. 1.2.1935, в. Гібліцы Касімаўскага р-на Разанскай вобл., Расія), расійскі касманаўт. Двойчы Герой Сав. Саюза (1976, 1980), лётчык-касманаўт СССР (1976). Канд. тэхн. н. (1981). Скончыў Усесаюзны політэхн. ін-т (1963). З 1973 у атрадзе касманаўтаў. Як бортінжынер здзейсніў касм. палёты: разам з В.Ф.*Быкоўскім* на караблі «Саюз-22» (15—23.9.1976), з Ю.В.*Малышавым* на караблі «Саюз Т-2» і арбітальным комплексе «Салют-6» — «Саюз-36» (5—9.6.1980). У космасе правёў 11,8 сут.

А.Н.Аксёнаў.

**АКСЁНЦАЎ** Сяргей Ліпавіч (н. 15.1.1936, Мінск), бел. біяфізік. Д-р біял. н. (1985). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1959). З 1966 у Ін-це фотабіялогіі АН Беларусі. Навук. працы па малекулярнай фармакалогіі ўзбудлівых мембран, структурных перабудовах і міжмалекулярных узаемадзеяннях у біял. мембранах, механізмах іоннага транспарту ў норме і паталогіі.

*Тв.*: Кооперативные переходы белков в клетке. Мн., 1970 (разам з С.В.Коневым, Я.А.Чарніцкім); Объёмная регуляция $Na^+/H^+$-обмена в эритроцитах крысы: эффект валиномицина (у саав.) // Биол. мембраны. 1993. Т. 10. № 2.

**АКСІГЕМАГЛАБІ́Н**, $HbO_2$, злучаны з кіслародам *гемаглабін*. Пераносіць кісларод ад органаў дыхання да тканак і

Да арт. **Аксанаметрыя**. Праект Дома Урада Беларусі. Архітэктар І.Лангбард. 1931.

вызначае ярка-чырвоны колер артэрыяльнай крыві. На ўтварэнне і дысацыяцыю $HbO_2$ у арганізме ўплывае канцэнтрацыя вуглякіслага газу ($CO_2$), pH і інш. фактары. Чым больш даступны кісларод для жывёліны, тым меншая роднасць гемаглабіну яе крыві да кісларoду (напр., у наземных жывёл яна меншая, чым у водных).

**АКСІГЕНАТЭРАПІ́Я**, тое, што *кіслародная тэрапія*.

**АКСІДАВА́ННЕ**, працэс утварэння на паверхні металічных вырабаў аксіднай плёнкі. Павышае каразійную ўстойлівасць, зносаўстойлівасць, электраізаляцыйныя ўласцівасці вырабаў, надае ім прывабны дэкар. выгляд (гл. *Паліна*). Аксідную плёнку атрымліваюць тэрмічным (гл. *Вараненне*), хімічным (з дапамогай растворaў кіслот, шчолачаў, спец. рэчываў) і электрахім. анодным (гл. *Анадзірванне*) спосабам. Выкарыстоўваюць у прылада-, самалёта-, машынабудаванні, для аддзелкі буд. і арх. дэталяў, метал. вырабаў быт. прызначэння. Гл. таксама *Акаліна*, *Акісленне металаў*.

**АКСІДА́ЗЫ**, ферменты класа *аксідарэдуктазаў*, што каталізуюць у жывых клетках акісляльна-аднаўленчыя рэакцыі, акцэптарам вадароду ў якіх з'яўляецца кісларод паветра. Пры гэтым утвараецца вада або перакіс вадароду ($H_2O_2$). Паводле структуры адрозніваюць А.-металаферменты (напр., тыразіназа і аскарбінатаксідаза маюць медзь) і А.-флавапратэіды (напр., глюкозааксідаза). Кафермент многіх А. — вытворныя вітаміну $B_2$ — ФАД або ФМН. А. адыгрываюць значную ролю ў катабалізме (распадзе) і дэтаксікацыі розных злучэнняў (напр., монаамінаксідаза разбурае біягенныя аміны).

**АКСІДАРЭДУКТА́ЗЫ**, клас ферментаў, якія каталізуюць акісляльнааднаўленчыя рэакцыі. Трапляюцца ва ўсіх жывых клетках і адыгрываюць значную ролю ў забеспячэнні іх энергіяй. У залежнасці ад характару акісляльнай групы А. падзяляюць на падкласы, якія дзейнічаюць на спіртавую, альдэгідную або кетонную, этыльную і інш. групы. Акцэптарамі электронаў і пратонаў з'яўляюцца НАД, НАФД, цытахромы, хіноны і інш. злучэнні. Вядома больш за 200 А., найбольш значныя: *дэгідрагеназы* (пераносяць вадарод і электроны пры дыханні і фотасінтэзе), *аксідазы*, *пераксідазы*, *гідраксідазы*, аксігеназы.

**АКСІ́ДЫ**, в о к і с л ы, злучэнні хімічных элементаў з кіслародам. Солеўтваральныя А. ўзаемадзейнічаюць з вадой; падзяляюцца на асноўныя (напр., $Na_2O$, $CaO$, $FeO$), кіслотныя (напр., $CO_2$, $P_2O_5$, $SO_3$) і амфатэрныя (напр., $ZnO$, $Al_2O_3$). Да нясолеўтваральных А. належаць $CO$, $NO$. Атрымліваюць акісленнем ці тэрмічным раскладаннем адпаведных гідраксідаў або соляў. Пашыраны ў прыродзе: А. вадароду (вада) стварае *гідрасферу*, гал. саст. частка горных парод — А. крэмнію, А. алюмінію, жалеза і інш. А. ўтвараюць руды — асн. форму метал. карысных выкапняў.

**«АКСІДЭ́НТАЛ ПЕТРО́ЛЕУМ»** (Occidental Petroleum), прамысловая манаполія ЗША. Засн. ў 1920. Дзейнічае ў нафтагазавай, харчасмакавай, хім., вугальнай і інш. галінах прам-сці. Здабывае нафту і газ у ЗША, Канадзе, брытанскім сектары Паўн. м., Перу, Балівіі і інш., праводзіць геолагаразведачныя работы на нафту і газ у 32 краінах (1985).

**АКСІЁМА** (грэч. ахіо̄ma), палажэнне, якое прымаецца без лагічных доказаў на падставе непасрэднай перакананасці; сапраўднае зыходнае палажэнне, на якім грунтуюцца доказы інш. палажэнняў навук. тэорыі. Сістэма А. не з'яўляецца раз і назаўсёды закончанай і, як і самі А., змяняецца з развіццём чалавечага пазнання. Тэрмін «А.» ўпершыню сустракаецца ў Арыстоцеля, потым праз працы паслядоўнікаў і каментатараў Эўкліда трывала ўвайшоў у *геаметрыю*. У сярэднявеччы пранік ў інш. навукі, а праз іх — у штодзённы побыт, дзе А. наз. суджэнні, шмат разоў праверaныя на практыцы. Доўгі час А. разглядалася як вечная і непарушная ісціна, што не патрабуе доследу і не залежыць ад яго. Лічылася, што спроба абгрунтавання можа толькі падарваць яе відавочнасць. Пераасэнсаванне праблемы абгрунтавання А. змяніла і змест самога тэрміна, паводле якога А. не зыходны пачатак пазнання, а хутчэй яго прамежкавы вынік. Яна абгрунтоўваецца не сама па сабе, а як неабходны састаўны элемент тэорыі, пацвярджэнне якой ёсць адначасова і пацвярджэнне яе А. У сучаснай навуцы пытанне пра ісціннасць А. вырашаецца ў рамках іншых навук. тэорый або шляхам інтэрпрэтацыі дадзенай тэорыі. *У.К.Лукашэвіч.*



Аксініт.

**АКСІКІСЛО́ТЫ**, карбонавыя кіслоты, у малекулах якіх ёсць карбаксільная (-COOH) і гідраксільная (-OH) групы. Паводле ўзаемнага размяшчэння гэтых груп адрозніваюць α-, β-, γ-, S-А. Адыгрываюць вял. ролю ў біяхім. працэсах раслінных і жывых арганізмаў, напр. *лімонная кіслата, малочная кіслата, саліцылавая кіслата, яблычная кіслата*.

**АКСІ́МАРАН**, а к с ю м а р а н (грэч. охутōton дасціпна-недарэчнае), спалучэнне процілеглых або кантрастных паняццяў, якія лагічна выключаюць адно аднаго, але ўжытыя разам ствараюць новы маст. вобраз («звонкая цішыня», «пакутлівае шчасце», «жывы труп»).

**АКСІНІ́Т** (ад грэч. ахінē сякера), мінерал падкласа сілікатаў, бораалюмасілікат ($Ca,Mn,Fe)_3Al_2Bo_3(Si_4O_{12})OH$. Утварае крышталі, друзы, масы фіялетавага, зялёнага, жоўтага, карычневага і інш. колераў. Бляск шкляны. Празрысты да паўпразрыстага. Цв. 6,5—7. Шчыльн. 3,2—3,3 г/см$^3$. Трапляецца ў кантактна-метасаматычных пародах, гідратэрмальных жылах, спадарожнічае рудам металаў. Другасны каштоўны камень.

**АКСІПРАЛІ́Н**, 4-аксіпіралідзін-2-карбонавая кіслата, гэтэрацыклічная *амінакіслата*. Упершыню выдзелены ням. хімікам-арганікам Э.Фішэрам (1902). Мае 4 аптычна актыўныя формы: L-, D-, ала-L-, ала-D-А. Прыродны L-А. — спецыфічная састаўная ч. бялкоў жывёл (калагену і эластыну) і раслін. У жывых клетках L-А. утвараецца гідраксіліраваннем звязанага ў бялках *праліну*. Ала-L-А. выяўлены ў свабодным стане ў кветках сандалавага дрэва, уваходзіць у склад таксічных пептыдаў бледнай паганкі.

**АКСІТАЦЫ́Н**, гармон пазваночных жывёл і чалавека, які ўтвараецца ў гіпаталамусе (паравентрыкулярным ядры), пераносіцца ў заднюю долю гіпофіза, потым выдзяляецца ў кроў. Пептыд складаецца з 9 амінакіслотных астаткаў. Стымулюе скарачэнні гладкіх мышцаў, асабліва мышцаў маткі і малочных залозаў. Выдзяляецца ў перыяд лактацыі пры раздражненні саскоў, пры расцяжэнні маткі ў познія тэрміны цяжарнасці. Выкарыстоўваецца ў акушэрстве.

**АКСІЎРО́З**, інвазійная хвароба коней, аслоў, мулаў, зебраў, якая выклікае парушэнне дзейнасці стрававальнага тракту, пашкоджанне скуры каля кораня хваста (зачос хваста). Узбуджальнік — вастрыца конская, што паразітуе пераважна ў абадочнай кішцы тоўстага кішэчніка. Яйцы развіваюцца ў вонкавым асяроддзі. Заражэнне адбываецца праз кармы, ваду, пры аблізванні навакольных прадметаў, забруджаных яйцамі вастрыц. Хварэюць часцей маладыя і старыя коні ў стойлавы перыяд.

**АКСІЯЛО́ГІЯ** (ад грэч. ахіа каштоўнасць + *...логія*), вучэнне аб *каштоўнасцях*; філас. тэорыя агульназначных прынцыпаў, якія вызначаюць матывацыю і накіраванасць дзеянняў чалавека. Як навук. дысцыпліна сфарміравалася ў 2-й пал. 19 ст., хоць пытанні прыроды каштоўнасцяў (сэнс жыцця, сутнасць дабра і зла, справядлівасці і несправядлівасці) ставіліся на працягу ўсёй гісто-

рыі філасофіі, пачынаючы са старажытнасці. У ант. і сярэдневяковай філасофіі (Арыстоцель, Платон, Пратагор, Сакрат, Аўгусцін, П.Абеляр, Фама Аквінскі і інш.) каштоўнасныя характарыстыкі ўключаліся ў само паняцце рэальнасці і вызначаліся нерасчлянёнасцю *анталогіі* і А., *быцця* і каштоўнасці. Упершыню разгорнутае вучэнне аб каштоўнасці даў ням. філосаф Р.Г.Лотцэ, які ўвёў у навук. ўжытак паняцце «аб'ектыўнай значнасці лагічных і матэматычных ісцін» у адрозненне ад іх эмпірычнага існавання — быцця. Адзін з заснавальнікаў *бадэнскай школы* неакантыянства В.*Віндэльбанд* да агульнаазначных каштоўнасцяў адносіў ісціну, дабро і прыгажосць, а навуку, правапарадак і рэлігію разглядаў як даброты культуры, без якіх чалавецтва не можа існаваць. Паводле Г.*Рыкерта*, найб. агульнай характарыстыкай эмпірычных каштоўнасцяў з'яўляецца воля звышіндывід. суб'екта, якая імкнецца спасцігнуць ісціну. З паняцця волі пры абгрунтаванні А. выходзілі і прадстаўнікі ням. школы неакантыянства Г.*Коген* і Н.Мюнстэрберг. Паслядоўнікі гусерліянскай школы неакантыянства Ф.*Брэнтана*, М.*Гартман*, А.Мейнанг, М.*Шэлер* лічылі, што крыніцай станоўчых каштоўнасцяў з'яўляюцца эмацыянальныя акты перавагі (любоў, спачуванне), а адмоўныя каштоўнасці ўзнікаюць ад акта агіды (нянавісці). Як незямную сутнасць «па-за прасторай і часам» трактуюць каштоўнасць прадстаўнікі *неапратэстанцызму, неатамізму, інтуітывізму* і інш. Прыхільнікі натуралістычных тэорый каштоўнасці (*геданізм*, эвалюцыйная этыка, *эўдэманізм*, тэорыя інтарэсаў) разглядаюць каштоўнасць як функцыю прыстасавання да навакольнага асяроддзя, выражэнне натуральных патрэбнасцяў чалавека і яго імкнення да асалоды і шчасця. У сацыялогіі паняцце каштоўнасцяў увёў М.*Вебер*, які зыходзіў з непазбежнай сувязі любога пазнання з «каштоўнаснымі ідэямі», інтарэсамі кожнага даследчыка. Паводле «структурнага функцыяналізму» Т.*Парсанса* каштоўнасці — вышэйшыя прынцыпы, на аснове якіх забяспечваюцца нармальнае функцыянаванне «сістэмы грамадства» і «сістэмы асобы» — згода (кансенсус) у малых грамадз. групах і ў грамадстве ў цэлым. Аналіз прычын трагічных канфліктаў і бедстваў, пошук шляхоў пераадолення экалаг. і ядзернай катастроф, якія пагражаюць чалавецтву, натуральна прывіў у сярэдзіне 20 ст. да ідэі прыярытэтнасці агульначалавечых каштоўнасцяў, надання ім статуса зыходных арыенціраў міжнар. і ўнутрыпаліт. жыцця, маральных паводзін людзей. Такое разуменне ўзаемасувязі глабальных праблем і агульначалавечых каштоўнасцяў выказвалі А.Эйнштэйн, Д.Бел, Б.Расел, Т. дэ Шардэн, А.Швейцэр, М.А.Бярдзяеў, А.Д.Сахараў і інш.

На Беларусі філас. прынцып духоўнай самакаштоўнасці чалавека, маральныя ідэалы дабра і справядлівасці знайшлі адлюстраванне ў дзейнасці і творчасці Клімента Смаляціча, Ефрасінні Полацкай і Кірылы Тураўскага. У самаахвярным служэнні Бацькаўшчыне, агульнаму дабру і шчасцю суайчыннікаў бачыў галоўнае прызначэнне асобы Ф.Скарына. Яго паслядоўнікі і пераемнікі М.Гусоўскі, С.Будны, В.Цяпінскі, А.Волан, Мялецій Сматрыцкі, Л.Карповіч, Сімяон Полацкі і інш. мысліцелі-гуманісты вылучалі як каштоўныя якасці чалавечай асобы высокую духоўнасць, талерантнасць, нац. самасвядомасць, павагу да людзей інш. нацыянальнасцяў. Дыялектычную ўзаемасувязь асобасных, нацыянальна-своеасаблівых і агульначалавечых каштоўнасцяў і інтарэсаў адзначалі ў сваёй творчасці К.Каліноўскі, Ф.Багушэвіч, М.Багдановіч, Я.Купала, А.Луцкевіч, Я.Лёсік, В.Ластоўскі, І.Канчэўскі, У.Самойла, Ф.Шантар і інш. дзеячы культуры, ідэолагі нац.-культ. адраджэння.



Падоўжны разрэз **аксіяльна-поршневай помпы** з нахіленым дыскам (шайбай): 1 — корпус; 2 — блок цыліндраў; 3 — поршань; 4 — нахілены дыск (шайба); 5 — вал; 6 — поласць усмоктвання; 7 — палец (стрыжань); 8 — залатнік; 9 — поласць нагнятання.

Прадстаўнікі сучаснай бел. гуманістыкі разглядаюць каштоўнасці як неад'емны кампанент чалавечага быцця і існавання, даследуюць іх у арганічнай узаемасувязі з праблемамі ўмацавання суверэнітэту краіны, усведамлення кожным чалавекам сваёй нац. годнасці, прыналежнасці да цывілізаванай сям'і еўрапейскіх народаў і агульначалавечай супольнасці.

*Літ.*: Абдзіраловіч І. Адвечным шляхам: (Даследзіны бел. светапогляду). Вільня, 1921; 4 выд. Мн., 1993; Глобальные проблемы и общечеловеческие ценности: Пер. с нем. и фр. М., 1990; Майхрович А.С. Поиск истинного бытия и человека: Из истории философии и культуры Беларуси. Мн., 1992; Праблемы развіцця сучаснай філасофіі. Мн., 1994; Weber M. Gesammelte Aufsätze zur Wissenschaftslehre. Tübingen, 1951.

*С.Ф.Дубянецкі.*

**АКСІЯ́ЛЬНА-ПО́РШНЕВАЯ ПО́МПА**, помпа ротарнага тыпу з вярчальным рухам ротара і зваротна-паступальным рухам поршняў (звычайна 7—9). Прызначана для нагнятання мінер. масла ў гідрасістэмы станкоў, транспартна-цягавых машын і абсталявання. Можа выкарыстоўвацца як гідраўлічны рухавік.

Пры вярчэнні ротара галоўкі поршняў слізгаюць па апорнай шайбе (пліце) і рухаюцца адносна ротара ўздоўж яго восі. Велічыня падачы масла вызначаецца рухам поршняў. Масла ўсмоктваецца і нагнятаецца праз размеркавальны дыск, злучаны каналамі з масляным бакам. Прадукцыйнасць да 800 л/мін, ціск да 30 МПа, аб'ёмны ккдз да 0,96.

**АКСІЯМАТЫ́ЧНЫ МЕ́ТАД**, спосаб пабудовы навук. тэорыі ў выглядзе сістэмы пастулатаў (*аксіём*) і правіл вываду (аксіяматыкі), што дае магчымасць логікавымі разважаннямі атрымліваць сцвярджэнні (*тэарэмы*) дадзенай тэорыі.

Узнік у работах стараж.-грэч. матэматыкаў. Напр., у «Асновах» Эўкліда праведзена ідэя атрымання асн. зместу геаметрыі з невялікай колькасці аксіём, праўдзівасць якіх лічыцца відавочнай. Адкрыццё ў 19 ст. *неэўклідавых геаметрый* стымулявала ўзнікненне праблем больш агульнага характару (напр., несупярэчлівасці, паўнаты і незалежнасці той ці інш. сістэмы аксіём). Гэта адкрыла шлях да фармалізаванага развіцця тэорый: пошуку інш. сістэм паняццяў (тэорый, галін ведаў), якія падпарадкоўваюцца тым жа аксіёмам, выяўлення новых інтэрпрэтацый пэўнай сістэмы аксіём, што дало магчымасць адкрываць новыя навук. факты. Д.*Гільберт* і яго школа спадзяваліся на аснове А.м. вырашыць гал. пытанні абгрунтавання матэматыкі. Аднак вынікі аўстр. і амер. матэматыка і логіка К.Гёдэля (1931) выявілі неажыццявімасць гэтай праграмы, напр. тэарэма аб непаўнаце арыфметыкі сведчыць аб абмежаванасці А.м. У 20 ст. дзякуючы развіццю *матэматычнай логікі* стала магчымым аксіяматызаваць тыя сродкі логікі, з дапамогай якіх выводзяцца адны сцвярджэнні аксіяматычнай тэорыі з інш. яе сцвярджэнняў, што мае істотнае значэнне для аўтаматызацыі разумовай працы.

Сучасныя навук. тэорыі, пабудаваныя пры дапамозе А.м., наз. дэдуктыўнымі. Усе паняцці такіх тэорый (акрамя фіксаванай колькасці першапачатковых) уводзяцца пры дапамозе вызначэнняў, якія выражаюць іх змест праз першапач. паняцці. У той ці інш. меры дэдуктыўныя доказы, характэрныя для А.м., выкарыстоўваюцца ў многіх навуках, найб. у матэматыцы, логіцы, некаторых раздзелах фізікі, біялогіі і інш. Тэорыі, пабудаваныя пры дапамозе А.м., нярэдка маюць выгляд фармалізаваных сістэм, якія даюць дакладнае апісанне лагічных сродкаў вываду *тэарэм* з аксіём. Доказ такой тэорыі ўяўляе сабой паслядоўнасць формул, кожная з якіх з'яўляецца аксіёмай або атрымліваецца з папярэдніх формул па адным з прынятых правіл вываду. У адрозненне ад такіх фармальных доказаў уласцівасці самой фармальнай сістэмы ў цэлым вывучаюцца змястоўнымі сродкамі метатэорыі. Асн. патрабаванні да аксіяматычных фармальных сістэм: несупярэчлівасць, паўната, незалежнасць аксіём. А.м. — адзін з метадаў пабудовы навук. ведаў, які мае абмежаванае выкарыстанне, бо патрабуе высокага ўзроўню развіцця навук. тэорыі. Нават некаторыя дастаткова багатыя навук. тэорыі (напр., арыфметыка натуральных лікаў)

не дапускаюць поўнай аксіяматызацыі. Гэта сведчыць аб немагчымасці поўнай фармалізацыі навук. ведаў.

*Літ.:* Садовский В.Н. Аксиоматический метод построения научного знания // Философские вопросы современной формальной логики. М., 1962; Столл Р. Множества. Логика: Аксиоматич. теории.: Пер. с англ. М., 1968; Новиков П.С. Элементы математической логики. 2 изд. М., 1973.

*Р.Т.Вальвачоў, У.К.Лукашэвіч.*

**АКСО́Н** (ад грэч. axōn вось), нейрыт, восевы цыліндр, адростак *нейрона*, які праводзіць нерв. імпульсы ад цела нерв. клеткі да мышачных і залозістых клетак органаў, якія інервуюцца, або да інш. нейронаў. Ад кожнай нерв. клеткі адыходзіць адзін А. дыяметрам у некалькі мікронаў, даўж. да 1 м і больш (у некаторых жывёл трапляюцца гіганцкія А. таўшчынёй да дзесятых доляў міліметра). Пачатковы сегмент А. (бугарок) найбольш узбудлівы і з'яўляецца месцам генерацыі нерв. імпульсаў. Канцавыя разгалінаванні (тэрміналі) утвараюць сінаптычныя кантакты з інш. нейронамі, мышцамі або залозістымі клеткамі. Хуткасць перадачы ўзбуджэння залежыць ад структуры і дыяметра А., ступені пакрыцця іх міэлінавай абалонкай. Пучкі А. і *дэндрытаў* утвараюць нервы.

*А.С.Леанцюк.*

**АКСУ́-ДЖАБАГЛЫ́**, запаведнік у Казахстане, у зах. Цянь-Шані паўн.-зах. ч. Таласкага Алатау. Засн. ў 1926. Пл. больш за 74 тыс. га (у т.л. 10 377 га пад лясамі, 3830 га займаюць лугі, 116 га — вадаёмы). У запаведнік уваходзяць даліны рэк Джабаглы, Ірсу, Аксу з каньёнам (глыб. да 500 м), 9 невял. азёраў і каля 20 ледавікоў. Ахоўваюцца і аднаўляюцца прыродныя комплексы дрэвава-хмызняковай і лугавой расліннасці. Растуць 23 віды пладовых дрэў і кустоў, шмат дэкар. раслін. У фауне трапляюцца млекакормячыя — сібірскі горны казёл, архар, марал (акліматызаваны), даўтахвосты сурок, птушкі — звычайныя кеклік, сіняя птушка, улар, перапёлка, вяхір і інш.

**АКСУ́М**, горад на Пн Эфіопіі. Мяркуюць, што засн. каля сярэдзіны 1-га тыс. да н.э. паўд.-араб. плямёнамі. У 1 ст. н.э. цэнтр *Аксумскага царства*. У выніку заняпаду дзяржавы страціў паліт. і культ. значэнне, але застаўся асяродкам копцкай царквы («святы горад» коптаў) і месцам каранацыі *негусаў*. З 1906 вядуцца раскопкі. Выяўлены рэшткі пабудоў палацавага комплексу, каменныя троны, некропаль з надмагільнымі стэламі-абеліскамі выш. да 33 м з барэльефамі і шматлікімі надпісамі на стараж. эфіопскай і грэч. мовах і інш.

**АКСУ́МСКАЕ ЦА́РСТВА**, старажытная дзяржава на тэр. паўн. Эфіопіі з цэнтрам у г. *Аксум*. Першыя звесткі пра А.ц. адносяцца да 1 ст. н.э. Зручнае геагр. становішча на гандл. шляхах з Індыі і Усх. Афрыкі ў Міжземнамор'е спрыяла эканам. і культ. росквіту А.ц. З канца 3 ст. дасягнула вял. магутнасці. У час праўлення цара Эзана (пач. 4 ст.) заваявана *Нубія*, ішла барацьба (4—6 ст.) з *Хім'ярыцкім царствам* за панаванне ў Паўд. Аравіі. У 4 ст. ў А.ц. пранікла хрысціянства, якое ў барацьбе з іудзействам замацавала візант. ўплыў. Пасля захопу персамі Паўд. Аравіі (6 ст.) і арабамі Егіпта (7 ст.) пачаўся эканам. і паліт. заняпад, паступова А.ц. распалася.

Да арт. Аксум. Гіганцкая стэла-абеліск.

**«АКСЬЁН ФРАНСЭ́З»** (L'Action francaise літар. «Французскае дзеянне»), ультраправая антырэсп. арг-цыя ў Францыі ў 1899—1944. Засн. Ш.*Марасам*, арганізацыйна афармілася ў 1905. У 1930-я г. набыла фаш. характар. Яе ўзбр. атрады («Каралеўскія малойчыкі») прымалі ўдзел у фаш. путчы 6.2.1934. У час ням.-фаш. акупацыі Францыі (1940—44) існавала легальна, падтрымлівала палітыку ўрада *Петэна*, накіраваную на супрацоўніцтва з акупантамі. Пасля вызвалення Францыі ліквідавана.

**АКТ** (лац. actus), 1) учынак, дзеянне. 2) Дакумент, які ўстанаўлівае пэўныя прававыя адносіны паміж юрыд. бакамі або паміж аўтарам і адрасатам А. (*акт дыпламатычны, акт юрыдычны, акт на права валодання (карыстання) зямлёй, акты органаў дзяржаўнага кіравання, акты органаў дзяржаўнай улады, акты цывільнага стану* і інш.). 3) Закончаная частка драм. твора, спектакля; тое, што і *дзея*. А. ў спектаклі раздзяляюцца перапынкамі (*антрактамі*). Можа падзяляцца на з'явы, эпізоды, сцэны, карціны. Падзел на А. існуе з часоў рымскага тэатра (п'еса мела абавязкова 5 А.). 4) У выяўл. мастацтве — выява аголенага чалавечага цела; гл. *Ню*.

**АКТ ДЫПЛАМАТЫ́ЧНЫ**, пісьмовы тэкст, які ўручаецца або дасылаецца органамі знешніх зносін адной дзяржавы органам знешніх зносін інш. дзяржавы. Найб. пашыраныя А.д.: *нота, мемарандум*, афіц. ліст, памятная запіска.

**АКТ НА ПРА́ВА ВАЛО́ДАННЯ (КАРЫСТА́ННЯ) ЗЯМЛЁЙ**, дзярж. пасведчанне пра наяўнасць права на ўласнасць, валоданне або карыстанне зямельным участкам. Выдаецца мясц. саветамі дэпутатаў, інш. дзярж. органамі Рэспублікі Беларусь. Складаецца ў 2 экзэмплярах: 1-ы экз. выдаецца ўласніку, землеўладальніку або землекарыстальніку, 2-і захоўваецца ў адпаведным Савеце дэпутатаў. Парадак перадачы зямельных участкаў у карыстанне, валоданне або адчужэнне іх у прыватную ўласнасць рэгулюецца дзярж. зямельным заканадаўствам.

*Н.А.Карповіч.*

**АКТ ЮРЫДЫ́ЧНЫ**, афіцыйны дакумент, які выдаецца дзярж. органам ці службовай асобай у межах іх кампетэнцыі і мае абавязковыя для выканання прадпісанні. Падзяляюцца на нарматыўныя (устанаўліваюць нормы права і рэгламентуюць пэўную сферу грамадскіх адносін) і індывідуальныя (спараджаюць канкрэтныя правы і абавязкі для канкрэтных суб'ектаў права) акты. А.ю. наз. таксама дакумент, які сведчыць аб *факце юрыдычным*.

**АКТАБО́Л** (ад грэч. oktobolon 8 аболаў), старажытна-грэчаская сярэбраная манета. Маса 5,5 г. Складала 1/3 афінскай *тэтрадрахмы* ці 4/6 *драхмы*.

**АКТА́ВА** (італьян. ottava ад лац. octava восьмая) у акустыцы, пазасістэмная безразмерная адзінка частотнага інтэрвалу. Абазначаецца — акт. 1 акт. — інтэрвал паміж дзвюма частотамі, лагарыфм адносіны якіх пры аснове 2 роўны адзінцы, што адпавядае адносіне верхняй гранічнай частаты да ніжняй гранічнай частаты, роўнай 2.

У музыцы, 1) восьмая ступень дыятанічнага *гукарада*. Мае аднолькавую назву з выходнай, аднародная з ёю ў гучанні, але адрозніваецца вышынёю.

Да арт. Актава.

2) Самы нізкі па вышыні з абертонаў, якія ўваходзяць у склад кожнага гуку; лічбы ваганняў А. і выходнага гуку суадносяцца як 2:1. 3) Частка муз. гукарада, якая ўключае 7 асн. ступеняў дыятанічнага гукарада ці 12 гукаў (паўтонаў) храматычнай гамы ад «до» да «сі». Усяго ў муз. гукарадзе 7 поўных і 2 няпоўныя А.: субконтрактава (3 верхнія гукі — $A_2$, $B_2$, $H_2$), контрактава, вялікая, малая, 1-, 2, 3, 4, 5-я (адзін ніжні гук — $C^5$) актавы. Найб. поўнае ўяўленне пра падзел гукавой шкалы на А. дае клавіятура фп. (гл. рыс.). 4) Інтэрвал, які ахоплівае 8 ступеняў дыятанічнага гукарада і складаецца з 6 цэлых тонаў. 5) Назва самага нізкага *баса* (актавіст) у практыцы харавых спеваў.

У паэзіі — васьмірадковая страфа з цвёрдым спалучэннем рыфмы: першыя 6 радкоў аб'яднаны дзвюма перакрыжаванымі рыфмамі, а 2 апошнія — сумежнымі (АбАбАбвв), з чаргаваннем мужчынскіх і жаночых клаўзул. Узнікла ў італьян. нар. паэзіі, росквіту дасягнула ў эпоху Адраджэння (Л.Арыёста, Т.Таса, Л.Камоэнс). А. напісаны «Дон Жуан» Дж.Байрана, «Домік у Каломне» А.Пушкіна. У бел. паэзіі да А. ўпершыню звярнуліся Я.Купала («Спроба актавы») і М.Багдановіч («Актава»).

**АКТАВІЯ́Н** Гай Юлій Цэзар, гл. *Аўгуст* Гай Актавій.

**А́КТАВЫЯ КНІ́ГІ**, спецыяльныя кнігі ў судах ВКЛ і Польшчы ў 14—18 ст. У ВКЛ афіцыйна ўведзены Статутам ВКЛ 1529. Да сярэдзіны 16 ст. ўсе запісы рабіліся ў адной кнізе паводле часу паступлення спраў у суд. Паводле Статута ВКЛ 1566 зацверджаны земскі і гродскі суды з асобнымі А.к., якія падзяляліся на паточныя (запісваліся скаргі істцоў, пярэчанні адказчыкаў, данясенні судовых чыноўнікаў), запісавыя (запісваліся акты натарыяльнага характару і афіц. дакументы — прывілеі вял. князёў, пастановы соймаў і соймікаў) і дэкрэтавыя (запісваліся судовыя пастановы, працэсуальныя дзеянні суда і бакоў). Трыбуналы, каптуровыя і інш. суды ВКЛ вялі ўласныя А.к.

**АКТАДРА́ХМА** (ад грэч. oktadrachmon 8 драхмаў), сярэбраная манета Стараж. Грэцыі, якая складала 8 *драхмаў*. Маса каля 28 г. Вядомы А. 6—3 ст. да н.э., якія чаканілі ў Абдэры, Іхнае, на Бізальтавых і Эдонскіх а-вах Аляксандрам Македонскім, Сідонам, Пталамеямі, а таксама залатая А. Пталамеяў пад назвай «мнеён».

**АКТАМІЯЗІ́Н**, комплексны бялок; асн. структурны кампанент мышачнай тканкі і інш. скарачальных утварэнняў, які экстрагуецца з іх канцэнтраванымі салявымі растворамі. Складаецца з *актыну* і *міязіну*, аб'яднаных адпаведна ў тонкія і тоўстыя філаменты. Фізікабіяхім. ператварэнні А. і суадносныя перамяшчэнні філаментаў ляжаць у аснове скарачэння мышцаў.

**АКТА́Н**, насычаны вуглевадарод нармальнай будовы, $CH_3(-CH_2)_6-CH_3$. Бясколерная вадкасць, мае спецыфічны пах, $t_{кіп}$ 125,6 °С, шчыльн. $0{,}702\cdot10^3$ кг/м$^3$, не растваральна ў вадзе, растваральна ў спіртах, ацэтоне, эфіры. Актанавы лік 17—19. У пэўных умовах ператвараецца ў араматычныя вуглевадароды (о-ксілол, этылбензол і інш.), што выкарыстоўваюцца ў працэсах каталітычнага *рыформінгу*.

Атрымліваюць рэктыфікацыяй бензінавых фракцый нафты і сінт. бензінаў. Мае 17 ізамераў, 2 з іх (трыметылпентан і тэтраметылбутан) з высокім актанавым лікам (97—105) — кампаненты маторнага паліва.

**А́КТАН**, Эктан (Acton) Джон Эмерык Эдуард Дальберг (Dalberg; 10.1.1834, Неапаль — 19.6.1902), англійскі ліберальны гісторык і паліт. дзеяч. У 1859—65 член парламента, лорд. Праф. (з 1895) Кембрыджскага ун-та. Католік па веравызнанні, А. лічыў гал. у гіст. працэсе развіццё ідэй, якія засн. на рэліг. вераванні. Прыхільнік канстытуцыйнай манархіі і памяркоўных рэформаў. Працы па праблемах сярэднявечча і новай гісторыі аб'яднаны ў зб-кі «Гісторыя свабоды і іншыя эцюды», «Гістарычныя эцюды і даследаванні» (абедзве 1907), «Царква і дзяржава» (1953) і інш. Ініцыятар выдання шматтомнай «Кембрыджскай новай гісторыі».



Актабол. Эфес. 258—202 да н.э. Серабро.

Актадрахма. Абдэра. Каля 544—450 да н.э. Серабро.

**АКТА́НАВЫ ЛІК**, умоўная колькасная характарыстыка ўстойлівасці да дэтанацыі маторнага паліва для карбюратарных рухавікоў. А.л. роўны колькасці (аб'ёмных %) ізаактану (А.л. прыняты за 100) у яго сумесі з н-гептанам (А.л. прыняты за 0). Для кожнага паліва падбіраецца эталонны эквівалент гэтай сумесі. А.л. бензінаў можна павысіць на 4—15 адзінак дабаўкай да 0,1% прысадак, напр. *тэтраэтылсвінцу*. Звычайна бензіны маюць А.л. 76—98.

Актаэдр.

**АКТА́НТ** (лац. Octans), каляпалярнае сузор'е Паўд. паўшар'я неба. Найб. яркая зорка А. 3,8 візуальнай *зорнай велічыні*. У А. знаходзіцца Паўд. полюс свету. Гл. *Зорнае неба*.

**АКТА́ЭДР** (ад грэч. oktō восем + hedra грань, мяжа), адзін з 5 правільных *многагранніка́ў*. Мае 8 трохвугольных граняў, 12 рэбраў і 6 вяршыняў, у кожнай з якіх збягаюцца па 4 рабры. Аб'ём А. $V=\frac{a^3\sqrt{2}}{3}\approx 0{,}4714\ a^3$, дзе a — даўжыня рабра.

**АКТО́Д** [ад грэч. oktō восем + *(электр)од*], электронная лямпа, якая мае 8 электродаў: анод, катод і 6 сетак; камбінацыя *трыёда* і *пентода*. Выкарыстоўваецца ў супергетэрадзінных радыёпрыёмніках як частотаператваральная (трыёдная частка) і змяшальная (пентодная частка) лямпа. Можа замяняцца гептодам і пентагрыдам.

**АКТУАЛІЗА́ЦЫЯ** (ад лац. actualis рэчаісны, сучасны), працэс пераходу аб'екта, з'явы і г.д. са стану магчымасці ў стан рэчаіснасці. Першапачатковае філас. абгрунтаванне і тэарэт. эксплікацыю атрымала ў працах *Арыстоцеля*. Сваімі поглядамі на ператварэнне патэнцыі ў рэальнасць праз А. Арыстоцель увёў у анталогію прынцып развіцця, узнікнення новага ў быцці. Напр., будаўніцтва дома і ўжо збудаваны дом — гэта А. («актуальнасць» дома ў адносінах да матэрыі, з якой ён складаецца — цэглы). Духоўныя асаблівасці чалавека актуалізуюцца ў яго паводзінах. Далейшае развіццё тэорыя А. набыла ў творах Г.Спенсера, Э.Гартмана, Х.Гёфдынга, а таксама тамістаў Фамы Аквінскага, К.Ранера і інш. Яны здолелі актуалізаваць гэты прынцып у адносінах да сучаснай ім сацыяльнай і духоўна-культ. рэчаіснасці. У сучасным грамадска-паліт. развіцці Беларусі як суверэннай і незалежнай дзяржавы вельмі важнае значэнне набывае А. прынцыпаў дэмакратыі, правоў чалавека і рыначных адносін ва ўсіх сферах сац. быцця.

*Літ.*: Аристотель. Метафизика. М.; Л. 1934. *Я.М.Бабосаў.*

**АКТУА́ЛЬНАЕ ЧЛЯНЕ́ННЕ СКА́ЗА**, падзел сказа (у жывым маўленні — выказванні) на тэму (зыходны пункт выказвання) і рэму (тое новае, што паведамляецца чытачу ці слухачу аб тэме). А.ч.с. накладваецца на фармальна-сінтаксічную будову сказа, і ён набывае

магчымасць перадаваць актуальную ў дадзеным кантэксце, важную ў момант паведамлення інфармацыю. Напр., у сказах «Мужчыны выйшлі на двор з хаты» і «На двор з хаты выйшлі мужчыны» суадносіны і камунікатыўная значымасць тэмы і рэмы розныя (з другога варыянта сказа вынікае, што ў хаце былі не толькі мужчыны). Тэма і рэма перадаюцца: лагічным націскам (прасадычныя сродкі), парадкам слоў (сінтаксічныя), часціцамі, займеннікамі, прыслоўямі або сінонімамі (марфалагічныя і лексічныя). У вусным маўленні тэма найчасцей падкрэсліваецца інтанацыяй, у пісьмовым — парадкам слоў. У экспрэсіўных выказваннях рэма можа папярэднічаць тэме, што патрабуе пры вымаўленні сказа асабліва ўзмоцненага націску і наз. эмфазай. Калі ў сказе адсутнічае проціпастаўленне тэмы і рэмы, ён наз. камунікатыўна нерасчлянёным. *А.Я.Міхневіч.*

**АКТУА́ЛЬНАСЦЬ**, важнасць, значнасць чаго-н. на гэты момант, сучаснасць, надзённасць (напр., А. пытання).

**АКТУА́РЫЙ**, служачы страхавой кампаніі, спецыяліст па тэхніцы страхавання. На аснове апрацоўкі і аналізу стат. звестак складае актуарныя табліцы і вызначае прыбытковыя, канкурэнтаздольныя ўзроўні страхавых прэмій, узносаў і г.д.

**А́КТЫ АРХЕАГРАФІ́ЧНАЙ ЭКСПЕДЫ́ЦЫІ**, «Акты, собранные в библиотеках и архивах Российской империи Археографическою экспедициею Императорской Академии наук», серыя дакументаў па гісторыі Расіі. Выдадзены Археаграфічнай камісіяй (т. 1—4. Спб., 1836). 1-ы т. ахоплівае 1294—1598, 2-і — 1598—1613, 3-і — 1613—45, 4-ы — 1645—1700. Змяшчаюць крыніцы па сац.-эканам. (дакументы пра збор дзярж. даходаў, вышук збеглых сялян і інш.), паліт., ваен. і царк. гісторыі (матэрыялы пра выбранне на царства Б.Гадунова, вайну з Рэччу Паспалітай 1654—67, царк. раскол і інш.). Да «Актаў...» складзены імянны, геагр. і прадметны паказальнікі (Спб., 1838).

**А́КТЫ ВІ́ЛЕНСКАЙ КАМІ́СІІ** (АВК), Акты Віленскай археаграфічнай камісіі (АВАК), шматтомны збор дакументаў па гісторыі Беларусі, Украіны і Літвы 14—19 ст. (т. 1—39. Вільня, 1865—1915). Сабраны дакументы на старабел., рус., польскай і лац. мовах па паліт., сац.-эканам., царк. гісторыі, этнаграфіі, пра развіццё прам-сці, сельскай гаспадаркі, культуры, становішчы яўрэяў і татараў ВКЛ, *вайну Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67*, вайну 1812. Выданне мела на мэце сцвердзіць справядлівасць далучэння Беларусі і Літвы да Рас. імперыі, прапагандаваць ідэю пра «спрадвечна рускі» характар ВКЛ. Нягледзячы на недахопы (тэндэнцыйнасць падбору матэрыялаў, недакладнасці перадачы тэкстаў, друкарскія памылкі) мае вял. каштоўнасць як крыніца па гісторыі Беларусі. *В.Ф.Голубеў.*

**А́КТЫ ВІ́ЛЕНСКІХ ЦЭ́ХАЎ**, «Akty cechów Wileńskich», зборнік дакументаў па гісторыі прафесійна-вытв. карпарацый у Вільні ў 1495—1700. Выдадзены ў Вільні ў 1939. Складальнік Г.Лаўмянскі. Змешчана 487 актаў (у т.л. прывілеі вял. князёў, выпіскі з соймавых пастаноў, судовыя рашэнні), звязаных з дзейнасцю віленскіх цэхаў, рамесных і мядовых «брацтваў», розных прафес. карпарацый — лекараў, купцоў, чл. віленскага магістрата і інш. Дакументы на лац., старабел., польск. мовах. Яны сведчаць, што многія цэхі Вільні аб'ядноўвалі бел. правасл. рамеснікаў. *Г.Я.Галенчанка.*

**А́КТЫ ГІСТАРЫ́ЧНЫЯ**, «Акты исторические, собранные и изданные Археографическою комиссиею», зборнік дакументаў па гісторыі Расіі. Выдадзены Археаграфічнай камісіяй (т. 1—5. Спб., 1841—42). Т. 1-ы ахоплівае 1334—1598, 2-і — 1598—1613, 3-і — 1613—45, 4-ы — 1645—76, 5-ы — 1676—1700. Змяшчаюць крыніцы па сац.-эканам., паліт., дыпламат. і ваен. гісторыі, гісторыі рус. царквы: асобныя дагаворныя граматы вялікіх і ўдзельных князёў 14—15 ст., даравальныя граматы духоўным і свецкім феадалам, устаўныя граматы, наказы ваяводам, дакументы пра збор дзярж. даходаў, судзебнікі 1497 і 1550, пасланні цара Івана IV да Максіма Грэка і ў Кірыла-Белазёрскі манастыр, урывак следчай справы пра С.Ц.Разіна і інш. Да «Актаў...» складзены імянны і геагр. паказальнікі (Спб., 1843).

**А́КТЫ ЗАХО́ДНЯЙ РАСІ́І**, «Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссиею» (АЗР), збор дакументаў па гісторыі Беларусі, Украіны і Літвы 14—17 ст. (т. 1—5. Спб., 1846—53). Складальнік і рэдактар І.І.*Грыгаровіч* (т. 1—4). Змешчана каля 2 тыс. дакументаў на бел. і ўкр. мовах, згрупаваных паводле храналагічна-тэматычнага прынцыпу, пераважаюць матэрыялы па паліт. і царк. гісторыі: судзебнік Казіміра IV 1468, велікакняжацкія прывілеі Полацкай і Віцебскай землям, прывілеі бел. гарадам на магдэбургскае права, даравальныя граматы (фундушы) царк. установам, «Устава на валокі» 1557, матэрыялы пра Лівонскую (Інфлянцкую) вайну 1558—83, Брэсцкую унію 1596, інтэрвенцыю Рэчы Паспалітай у Расію ў пач. 17 ст., казацкія войны ў 17 ст. і інш. *П.А.Лойка.*

**А́КТЫ КАНГРЭГА́ЦЫІ ПРАПАГА́НДЫ ВЕ́РЫ**, «Acta S.C. de propaganda fide ecclesiam catholicam Ucrainae et Bielarusiae spectantia», серыя публікацый дакументаў па гісторыі царквы на тэр. Беларусі і Украіны. Выдаецца ў Рыме з 1953 базыльянскім ордэнам. Змяшчае акты (пратаколы) пасяджэнняў кангрэгацыі (створана ў 1622 рымскім папам для каардынацыі місіянерскай дзейнасці; распараджалася уніяцкай царквой, кантралявала місіянерскую дзейнасць каталіцкіх ордэнаў на тэр. Беларусі і Украіны), а таксама пасланні да папскіх нунцыяў, пратаколы «партыкулярных» кангрэгацый, на якіх прымаліся рашэнні аб дзейнасці уніяцкай царквы ў ВКЛ. Крыніца для вывучэння палітыкі рымскай курыі ў ВКЛ, сац.-паліт. эканам., ідэалаг. дзейнасці уніяцкай царквы. *Г.Я.Галенчанка.*

**А́КТЫ КАРАЛЯ́ ПО́ЛЬСКАГА І ВЯЛІ́КАГА КНЯ́ЗЯ ЛІТО́ЎСКАГА АЛЯКСА́НДРА**, «Akta Aleksandra, króla polskiego, wielkiego księcia litewskiego i t.d. (1501—1506)», зборнік актаў Аляксандра. Выдадзены ў Кракаве ў 1927. Дакументы асвятляюць узаемаадносіны Польшчы з ВКЛ, Маскоўскай Руссю, Прусіяй, рымскай курыяй, Валахіяй, «Свяшчэннай Рымскай імперыяй», пытанні дзярж. і царкоўна-рэліг. уній. У зборы змешчаны праекты мірных дагавораў, пасольскія інструкцыі, дзярж. перапіска, дакументы соймаў. Большасць дакументаў на лац., частка на ням. і старабел. мовах; выяўлены ў архівах Варшавы, Кёнігсберга, Гданьска, Фраўэнбурга. *Г.Я.Галенчанка.*

**А́КТЫ ЛІТО́ЎСКАЙ МЕ́ТРЫКІ**, «Акты Литовской Метрики», зборнік дакументаў з *Метрыкі Вялікага княства Літоўскага* за 1413—1507. Выдадзены Ф.І.Леантовічам у Варшаве (т. 1, вып. 1—2, 1896—97). Уключана больш за 750 дакументаў на бел. і лац. мовах, выяўленых у 66 кнігах-копіях, што захоўваліся ў Варшаўскім архіве. Пераважаюць матэрыялы пра Беларусь і Літву, часткова — Украіну і Падляшша. Большасць з іх асвятляе сац.-эканам. і сац.-прававыя адносіны: прывілеі вял. князёў на зямельную ўласнасць, прыгонных сялян, судовыя дакументы, дагаворы купліпродажу маёнткаў, прывілеі на корчмы, мыта, дзярж. пасады і інш. З публічна-прававых актаў змешчаны агульназемскія прывілеі 15 ст., абласныя прывілеі 16 ст. *Г.Я.Галенчанка.*

**А́КТЫ ЛІТО́ЎСКА-РУ́СКАЙ ДЗЯРЖА́ВЫ**, «Акты Литовско-Русского государства», зборнік дакументаў па сац.-эканам. гісторыі ВКЛ 14—16 ст. Выдадзены ў Маскве (вып. 1, 1899; т. 2, 1897) М.В.Доўнар-Запольскім. Змешчаны дакументы на старабел. і лац. мовах з *Метрыкі Вялікага княства Літоўскага*: прывілеі гарадам на магдэбургскае права, велікакняжацкія граматы на землі, інвентары, матэрыялы Віленскіх 1563 і 1565, Гарадзенскіх 1567 і 1568, Люблінскага 1569

вальных соймаў, апісанне межаў ВКЛ з Маскоўскай дзяржавай 1523, попіс гарадоў ВКЛ з указаннем колькасці воінаў, адпраўленых імі на вайну (каля 1513), кантракты на арэнду велікакняжацкіх мытняў, корчмаў, прыходна-расходныя кнігі велікакняжацкіх пісараў, уставы сялянам гаспадарскіх уладанняў.

*В.Ф.Голубеў.*

**А́КТЫ МАСКО́ЎСКАЙ ДЗЯРЖА́ВЫ**, «Акты Московского государства, изданные Императорскою Академиею наук», збор дакументаў па паліт. і ваеннай гісторыі Расіі. Выдадзены Рас. АН пад рэд. Н.А.Папова і Дз.Я.Самаквасава (т. 1—3. Спб., 1890—1901). Том 1-ы ахоплівае 1571—1634, 2-і — 1635—59, 3-і — 1660—64. Змешчаны дакументы са справаводства Маскоўскага стала Разраднага прыказа: пра станічную і вартавую службу на Пд Расіі ў 1570—90-я г., засечную пабудову 1638, барацьбу з набегамі крымскіх татараў у 17 ст. Шэраг дакументаў прысвечаны ваен. дзеянням 1614—18, войнам з Рэччу Паспалітай (1632—34, 1654—67) і Швецыяй (1656—58), эканам., паліт., ваен. гісторыі Рэчы Паспалітай і Крыма; ёсць звесткі пра становішча служылых людзей, Маскоўскае паўстанне 1662.

**А́КТЫ О́РГАНАЎ ДЗЯРЖА́ЎНАГА КІРАВА́ННЯ**, дакументальная юрыд. форма дзейнасці выканаўчых і распарадчых органаў дзяржавы. У іх рэалізуюцца паўнамоцтвы адпаведных дзярж. органаў, змяшчаюцца правілы, афіцыйныя прадпісанні і ўказанні, абавязковыя да выканання. З'яўляюцца падзаконнымі, таму што прымаюцца на аснове законаў і ў адпаведнасці з імі ў межах кампетэнцыі пэўнага дзярж. органа. Лічацца нарматыўнымі, калі змяшчаюць нормы права, і індывідуальнымі, калі прымаюцца для вырашэння канкрэтных пытанняў. Сярод нарматыўных актаў Рэспублікі Беларусь асаблівае значэнне маюць пастановы і распараджэнні Кабінета Міністраў як вышэйшага выканаўчага і распарадчага органа краіны. Кіраўнікі мін-ваў, дзярж. к-таў і ведамстваў выдаюць, як правіла, загады і інструкцыі; выканкомы мясц. Саветаў дэпутатаў — рашэнні і распараджэнні; кіраўнікі аб'яднанняў, прадпрыемстваў, устаноў, арг-цый — загады, інструкцыі, распараджэнні. Такія акты звычайна набываюць сілу з моманту іх прыняцця або давядзення да ведама выканаўцаў. Тэрмін уступлення іх у дзеянне часам указваецца ў самім акце.

Кантроль над законнасцю актаў ажыццяўляюць вышэйшыя *органы дзяржаўнага кіравання*. У выпадку, калі акт ніжэйшага органа не адпавядае закону або акту вышэйшага органа, апошні абавязаны адмяніць яго. Агульны нагляд над законнасцю актаў ажыццяўляе пракуратура. Адпаведнасць нарматыўнага акта любога дзярж. органа Канстытуцыі і законам Рэспублікі Беларусь пры неабходнасці можа быць разгледжаны Канстытуцыйным Судом.

**А́КТЫ О́РГАНАЎ ДЗЯРЖА́ЎНАЙ УЛА́ДЫ**, дакументальная юрыд. форма выяўлення волі прадстаўнічых органаў дзярж. улады. У Рэспубліцы Беларусь — гэта законы, пастановы і інш. акты Вярх. Савета, указы Прэзідэнта, пастановы Прэзідыума Вярх. Савета, рашэнні мясц. Саветаў дэпутатаў усіх узроўняў, абавязковыя да выканання агульныя правілы або прадпісанні індывід. характару. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь мае найвышэйшую юрыд. сілу ў адносінах да ўсіх інш. законаў і актаў, яна вызначае парадак іх прыняцця і формы. Права прыняцця агульнадзярж. законаў належыць Вярх. Савету. Прэзідэнт выдае ў межах сваіх паўнамоцтваў указы і распараджэнні і кантралюе іх выкананне. Мясц. Саветы дэпутатаў на падставе дзеючага заканадаўства прымаюць рашэнні, якія маюць абавязковую сілу на падпарадкаванай ім тэрыторыі. Рашэнні мясц. Саветаў, якія не адпавядаюць заканадаўству, адмяняюцца вышэйстаячымі Саветамі. Кантроль за канстытуцыйнасцю А.о.дз.у. ажыццяўляе *Канстытуцыйны суд Рэспублікі Беларусь*, і тыя, што прызнаны ім неканстытуцыйнымі, не маюць юрыд. сілы.

**А́КТЫ ПАЎДНЁВАЙ І ЗАХО́ДНЯЙ РАСІ́І**, «Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссиею», шматтомны збор дакументаў па паліт., царк. і сац.-эканам. гісторыі Украіны і Беларусі з 1361 да 1678 (т. 1—15. Спб., 1861—92). Складальнікі-рэдактары М.І.Кастамараў і Г.Ф.Карпаў. Змешчаны дакументы пераважна на старабел. і стараўкр. мовах, якія асвятляюць сац.-эканам. адносіны ў ВКЛ, гісторыю праваслаўнай і уніяцкай царквы, дзейнасць брацтваў, сял.-казацкія паўстанні (у т.л. С.Налівайкі), войны сярэдзіны 17 ст. Сярод дакументаў прывілеі вял. князёў на землі, сялян, корчмы, мыта, кірмашы, на магдэбургскае права гарадам, адм. пасады, судовыя дакументы і інш.

*Г.Я.Галенчанка.*

**А́КТЫ РЭФАРМАЦЫ́ЙНЫХ СІНО́ДАЎ У ПО́ЛЬШЧЫ**, «Akta synodów różnowierczych w Polsce», шматтомнае выданне крыніц па гісторыі Рэфармацыі ў Польшчы і ВКЛ. Выдаюцца з 1966 у Варшаве. Ахопліваюць перыяд з 1550 да канца 17 ст. Выкарыстаны ўсе кодэксы пратаколаў рэфармацыйных сінодаў, упамінанні пра сіноды ў старадруках, асобныя акты, карэспандэнцыі, рэляцыі на польск., лац., чэшскай мовах. Асвятляецца арганізац., царкоўна-рэліг., ідэалаг. дзейнасць рэфармацыйных абшчын («Чэшскіх братоў», кальвіністаў, арыян), узаемаадносіны розных рэфармацыйных плыняў, палітыка вярх. улады ў адносінах да Рэфармацыі, удзел бел.-літ. дзеячаў у грамадска-паліт. жыцці Польшчы і ВКЛ.

*Л.С.Іванова.*

**А́КТЫ У́НІІ ПО́ЛЬШЧЫ З ЛІТВО́Ю 1385—1791**, «Akta Unii Polski z Litwą 1385—1791», зборнік дакументаў па гісторыі уніі (саюза) паміж Каралеўствам Польскім і ВКЛ. Выдадзены Польскай АН і Варшаўскім навук. т-вам (Кракаў, 1932). Складзены С.Кутшэбам і У.Сямковічам. Уключана 177 дакументаў на бел., польскай і лац. мовах. Першы змешчаны дакумент — акт *Крэўскай уніі 1385*, выдадзены Ягайлам, апошні — прынятая *Чатырохгадовым соймам 1788—92* канстытуцыя (закон) 20.10.1791 «Аб заручэнні абодвух народаў», якой замацоўваўся саюз абедзвюх дзяржаў (ВКЛ і Польшчы) у складзе Рэчы Паспалітай. Акрамя тэкстаў усіх уній паміж Польшчай і ВКЛ змешчана шмат дадатковых дакументаў.

*А.І.Грыцкевіч.*

**А́КТЫ ЦЫВІ́ЛЬНАГА СТА́НУ**, запісы дзярж. органамі (аддзеламі ЗАЦС або выканкомамі мясц. Саветаў) фактаў, якія вызначаюць цывільны стан: нараджэнне, смерць, шлюб або скасаванне яго, усынаўленне, перамену прозвішча або імя. Запісы А.ц.с. служаць таксама падставай для выяўлення колькасных і якасных змен у дэмаграфічных працэсах, адной з асноў сац.-эканам. планавання. У некаторых краінах, дзе царква не аддзелена ад дзяржавы, запісы А.ц.с. вядуць царк. ўстановы. У Рэспубліцы Беларусь парадак запісаў А.ц.с. рэгулюецца *Кодэксам аб шлюбе і сям'і* і інш. нарматыўнымі актамі.

**АКТЫВАЦЫ́ЙНЫ АНА́ЛІЗ**, радыеактывацыйны аналіз, метад вызначэння якаснага і колькаснага саставу рэчыва, які грунтуецца на апрамяненні (актывацыі) ат. ядраў і наступным вымярэнні іх радыеактыўнага выпрамянення. Упершыню выкарыстаны венг. хімікамі Дз.Хевешы і Г.Леві (1936).

А.а. бывае інструментальны (даследаванне другаснага выпрамянення з дапамогай спец. апаратуры без разбурэння пробы) і радыехімічны (хім. раздзяленне радыенуклідаў і вызначэнне актыўнасці кожнага з іх паасобку або ў невял. групе элементаў). Пры А.а. даследны матэрыял пэўны час апрамяняюць ядз. часціцамі, потым вымяраюць энергет. спектр, актыўнасць, перыяд паўраспаду $T_{1/2}$ радыеізатопа, які ўтварыўся ў выніку апрамянення. Ведаючы $T_{1/2}$, від радыеактыўнага ізатопа пасля апрамянення прама прапарцыянальная колькасці ядраў зыходнага (звычайна стабільнага) ізатопа, што дазваляе правесці колькасны аналіз. Адрозніваюць А.а. нейтронны, на зараджаных часціцах і на жорсткіх гама-квантах. Найб. пашыраны нейтронны А.а.: ядры большасці элементаў лягчэй актывуюцца нейтронамі; розніца ў значэннях эфектыўных сячэнняў ядз. рэакцый на нейтронах забяспечвае высокую выбіральнасць метаду адносна элементаў; мае высокую адчувальнасць ($10^{-7}$—$10^{-10}$% у залежнасці ад элемента). А.а. выкарыстоўваецца для ана-

лізу асабліва чыстых рэчываў, кантролю тэхнал. працэсаў, разведкі карысных выкапняў, у крыміналістыцы, археалогіі і інш. *Э.І.Пірэй.*

**АКТЫ́Н**, мышачны бялок. Мал. м. 42 000. Складаецца з 374 астаткаў амінакіслот і небялковай часткі (АТФ ці АДФ). Існуе ў глабулярнай (манамернай) і фібрылярнай (палімернай, дамінуе ў мышцах) формах. Утварае аснову тонкіх філаментаў мышачных *міяфібрыл* і *мікрафіламентаў* у нямышачных клетках. У папярочна-паласатых і гладкіх мышцах з *міязінам* утварае іх асн. структурны скарачальны комплекс — актаміязін. Зваротныя пераходы паміж манамернай і палімернай формамі ў нямышачных структурах фарміруюць рухомасць клетак, рух цытаплазмы, арыентацыю рэцэптараў на цытаплазматычнай мембране і інш.

**АКТЫНА**... [ад грэч. aktis (aktinos) прамень], першая састаўная частка складаных слоў, якая адпавядае па значэнні слову «прамяністы», словазлучэнню «прамянёвая энергія», напр. *актыналіт, актынаметрыя.*

**АКТЫНАБАЦЫЛЁЗ**, праактынамікоз, псеўдаактынамікоз, хранічная інфекцыйная хвароба жывёл, якая выклікаецца грыбком з кл. *актынаміцэтаў.* Пашырана ў многіх краінах свету, у т.л. на Беларусі. Хварэюць пераважна свойскія жывёлы (часцей маладняк буйн. раг. жывёлы, авечак, свіней) у зімова-веснавы перыяд. У арганізм узбуджальнік трапляе праз раны скуры або слізістай абалонкі рота, часцей з кормам. У хворых жывёл у мяккіх тканках галавы і шыі, лімфатычных вузлах з'яўляюцца шчыльныя гнойныя вузельчыкі, з наступным утварэннем свішчоў. У прафілактычных мэтах неабходна пазбягаць выпасу на нізкіх пашах, запарваць грубыя кармы.

**АКТЫНАЛІ́Т** (ад *актына...* + *...літ*), мінерал класа сілікатаў, манаклінны *амфібол*, $Ca_2(Mg,Fe^{2+})_5[Si_4O_{11}]_2(OH,F)_2$. Крышталі ігольчастыя, ніткападобныя. Агрэгаты прамяністыя, валакністыя або масіўныя (*нефрыт*). Колер зялёны, розных адценняў. Бляск шкляны. Паўпразрысты, рэдка празрысты. Цв. 5,5—6. Шчыльн. 3,2—3,3 г/см$^3$. Пародаўтваральны мінерал метамарфічных сланцаў і кантактных *скарнаў.* Выкарыстоўваецца ў вытв-сці аўтапакрышак як напаўняльнік.

**АКТЫНАМЕ́ТРЫЯ** (ад *актына...* + *...метрыя*), раздзел *метэаралогіі*, які вывучае перанос і ператварэнне сонечнага, зямнога і атмасфернага выпрамянення ў атмасферы Зямлі. Гал. задачы А. — вымярэнне прамой, рассеянай, сумарнай і адбітай радыяцыі і радыяцыйнага балансу зямной паверхні, вывучэнне заканамернасцяў паглынання і рассейвання радыяцыі ў атмасферы і геагр. размеркавання яе. Актынаметрычныя назіранні пачаліся ў 17 ст., на Беларусі з 1936. У 1994 праводзіліся на 10 станцыях: у Мінскім гідраметэацэнтры, на аграметэастанцыі Васілевічы, Палескай балотнай станцыі і інш.

*М.А.Гольберг.*

**АКТЫНАМІКО́З** (ад *актына...* + *...мікоз*), хранічная інфекцыйная хвароба жывёл, радзей чалавека, што выклікаецца грыбкамі з кл. *актынаміцэтаў*, якія пастаянна прысутнічаюць у арганізме (поласць рота, страўнікава-кішачны тракт, верхнія дыхальныя шляхі і інш.), а таксама пашыраны і ў прыродзе (глеба, расліны). Найчасцей хварэе буйн. раг. жывёла, успрымальныя авечкі, коні, свінні, драпежныя. У буйн. раг. жывёлы часцей пашкоджваюцца косці і тканкі ніжняй сківіцы, лімфавузлы, радзей іншыя часткі цела. Характарызуецца ўтварэннем шчыльных пухлін, інфільтратаў, абсцэсаў, свішчоў і рубцоў. У чалавека больш хварэюць мужчыны ва ўзросце 21—40 гадоў. Пры вузлаватай форме А.

Актыналіт.

ў глыбокіх слаях скуры ўтвараецца цвёрды, цвёрдаэластычны, маларухомы інфільтрат цёмна-чырвонага колеру з фіялетавым адценнем, які нагнойваецца і прарывае свішчамі з гноем. Пры бугарковай форме ў тоўшчы скуры і падскурнай клятчатцы ўзнікаюць дробныя, паўшарападобныя, цвёрдыя, бязбольныя, цёмна-чырвоныя бугаркі, якія найчасцей нарываюць з выдзяленнем кроплі гною, потым утвараюцца свішчы. Пашкоджваецца і падскурная клятчатка. Язвавая форма развіваецца ў аслабленых хворых. Язвы мяккія, няроўныя, скура вакол іх сіняватага колеру. Атэраматозная форма — інфільтрат дыяметрам да 5 см, эластычнай кансістэнцыі, акрэслена абмежаваны, з паслядоўным нагнойваннем, выдзяленнем гною і свішчамі.

*М.З.Ягоўдзік.*

Актынідыя каламікта.

**АКТЫНАМІЦЭ́ТЫ**, прамянёвыя грыбкі, група грамдадатных бактэрый, якія ўтвараюць клеткі або гіфы. Каля 700 відаў: уласна А., мікабактэрыі, стрэптаміцэты і інш. Большасць А. — *сапратрофы*; пашыраны ў глебе, вадаёмах і паветры, на раслінных рэштках.

Маюць нітчана-, палачка- ці кокападобную форму, бакавыя нарасці, большасць утвараюць міцэлій. Размнажаюцца спорамі або дзяленнем. Патагенныя для раслін, жывёл і чалавека віды выклікаюць *актынамікоз, актынабацылёз*, туберкулёз і інш. хваробы. Віды, якія прадуцыруюць антыбіётыкі, пігменты, вітаміны і інш., выкарыстоўваюцца ў мікрабіял. прам-сці.

**АКТЫНАМО́РФНАЯ КВЕ́ТКА**, гл. ў арт. *Кветка.*

**АКТЫНАФА́ГІ**, вірусы *актынаміцэтаў* і роднасных ім мікраарганізмаў. Выклікаюць спантаннае разбурэнне (лізіс) грыбкоў, што наносіць значную шкоду вытв-сці антыбіётыкаў.

**АКТЫНІ́ДЫ**, гл. *Актыноіды.*

**АКТЫНІ́ДЫЯ** (Actinidia), род павойных кустовых раслін сям. актынідыевых. Каля 40 відаў. Пашырана ў Паўд.-Усх. Азіі, на Д. Усходзе. На Беларусі 4 інтрадукаваныя віды, больш вядомыя А. каламікта (A. kolomicta) і А. востразубчастая (A. arguta).

А. каламікта (амурскі агрэст) найб. пашыраная ў культуры. Даўж. да 15 м. Кара цёмная. Ліслце дробнапілаватае з рыжаватымі валаскамі на жылках. Кветкі белыя. Цвіце ў чэрвені. Плады — зялёныя ягады даўж. 2—3 см, масай да 4 г, з сакавітай мякаццю, багатай цукрамі і вітамінам С, ядомыя. Каштоўны перганос (дае кветкавы пылок). Размнажаюць насеннем, чаранкамі і адводкамі. Добра расце на дрэніраваных, багатых перагноем глебах. Мароза- і газаўстойлівая.

**АКТЫ́НІІ**, марскія анемоны (Actiniaria), атрад марскіх кішачнаполасцевых жывёл. Існуюць як адзіночныя, радзей каланіяльныя бесшкілетныя паліпы. Каля 1,5 тыс. відаў. Пашыраны пераважна ў трапічных і субтрапічных морах. Трапляюцца ў Чорным, Баранцавым і далёкаўсходніх морах.

Цыліндрычнай формы, у папярочніку ад некалькіх міліметраў да 1,5 м, з венчыкам шчупальцаў вакол рота, звычайна ярка афарбаваныя. Сядзячыя або павольна перамяшчаюцца, закопваюцца ў грунт, зрэдку плаваюць. Кормяцца дробнымі воднымі жывёламі, у т.л. рыбамі. Размнажэнне палавое і вегетац. дзяленнем. Для многіх характэрны сімбіёз з *ра-*

*камі-пустэльнікамі* і інш. беспазваночнымі. Дотык шчупальцаў да чалавека можа выклікаць апёк скуры.

**АКТЫ́НІЙ** (лац. Actinium), Ac, радыеактыўны хімічны элемент з ліку *актыноідаў*, ат.н. 89. Вядомы 12 ізатопаў; найб. устойлівы $^{227}$Ac (перыяд паўраспаду 21,7 года — α- і β-выпрамяняльнік). У прыродзе сустракаецца ў рудах урану і торыю. Адкрыты франц. вучоным А.Дэб'ернам (1899). Серабрыста-белы метал, у выніку радыеактыўнага распаду свеціцца ў цемнаце, $t_{пл}$ 1050 °С. Хім. ўласцівасцямі блізкі да *лантану*.

Атрымліваюць пры апрамяненні $^{226}$Ra нейтронамі ў ядз. рэактарах. Выкарыстоўваецца ў нейтронных крыніцах. Высокатаксічны, ГДК у вадаёмах 34,8 Бк/л, у паветры $1{,}3\cdot10^{-9}$ Бк/л.

**АКТЫНІ́ЧНАСЦЬ** фатаграфічная, здольнасць светлавога выпрамянення аказваць фатагр. ўздзеянне на святлоадчувальны матэрыял. Пры нязменным у часе выпрамяненні мерай адноснай А. з'яўляюцца адносіны асветленасцяў, утвораных у плоскасці фатагр. матэрыялу дадзенай крыніцай і крыніцай параўнання, якія пры аднолькавых экспазіцыях і хім.-фатагр. апрацоўцы даюць аднолькавы фатагр. эфект.

**АКТЫНО́ГРАФ** (ад *актына...* + *...граф*), прылада для бесперапыннага аўтаматычнага запісу інтэнсіўнасці сонечнай радыяцыі. Складаецца з прыёмніка (часцей тэрмаэл. *актынометр*), які варочаецца геліястатам за сонцам, і рэгістратара-гальванографа (самапісны высокаадчувальны *гальванометр*).

**АКТЫНО́ІДЫ**, актыніды, сям'я з 14 хімічных радыеактыўных элементаў VII перыяду сістэмы элементаў з ат.н. 90—103: *торый, пратактыній, уран, нептуній, плутоній, амерыцый, кюрый, берклій, каліфорній, эйнштэйній, фермій, мендзялевій, набелій* і *лаўрэнсій*. Уран, торый, менш пратактыній ёсць у прыродзе, астатнія А. (наз. *трансуранавыя элементы*) атрыманы штучна ў выніку ядз. пераўтварэнняў. Вядучая роля ў сінтэзе і вывучэнні А. належыць Г.*Сібаргу*. А. — серабрыста-белыя метады высокай шчыльнасці (да $2\cdot10^4$ кг/м$^3$). Найб. легкаплаўкія нептуній і плутоній, $t_{пл}$ — 640 °С, астатнія плавяцца пры т-ры больш за 1000 °С. А. рэакцыйназдольныя, у здробненым стане пірафорныя, лёгка рэагуюць з вадародам, кіслародам, азотам, серай, галагенамі, утвараюць комплексныя злучэнні. Блізкасць хім. уласцівасцяў А. паміж сабой і з *лантаноідамі* звязана з падабенствам канфігурацый вонкавых электронных абалонак іх атамаў. Практычна выкарыстоўваюцца торый, уран, плутоній; плутоній-238, кюрый-244 — у вытв-сці ядз. крыніц эл. току бартавых касм. сістэм. Некаторыя нукліды А. — у медыцыне, дэфектаскапіі, актывацыйным аналізе, нукліды урану-235, плутонію-239 — паліва ў ядз. энергетыцы, крыніца энергіі ў ядз. зброі. А. і іх злучэнні надзвычай таксічныя, што абумоўлена іх радыеактыўнасцю.

*Літ.*: Сиборг Г.Т., Кац Дж.Д. Химия актинидных элементов: Пер. с англ. М., 1960; Келлер К. Химия трансурановых элементов: Пер. с англ. М., 1976; Лебедев И.А., Мясоедов Б.Ф. Последние достижения в аналитической химии трансурановых элементов // Радиохимия. 1982. Т. 24, вып. 6.

**АКТЫНО́МЕТР** (ад *актына...* + *...метр*), прылада для вымярэння інтэнсіўнасці прамой сонечнай радыяцыі. Прынцып дзеяння заснаваны на паглынанні зачэрненай паверхняй падаючай радыяцыі і ператварэнні яе энергіі ў цеплату.

**АКТЫ́Ў**, 1) любая ўласнасць кампаніі: машыны, абсталяванне, будынкі, запасы, банкаўскія ўклады і інвестыцыі ў каштоўныя паперы, патэнты, а ў рынкавай эканоміцы зах. краін і дзелавая рэпутацыя. 2) Частка бухгалтарскага балансу, якая адлюстроўвае матэрыяльныя і нематэрыяльныя каштоўнасці прадпрыемства паводле іх складу і размяшчэння. 3) Перавышэнне даходаў над расходамі

Актыніі: цэракціс і конскія.

Актынометр М-3.

ў некаторых відах балансаў (плацежных і інш.).

**АКТЫ́ЎНАЕ АСЯРО́ДДЗЕ**, 1) у квантавай электроніцы — рэчыва, у якога высокія энергетычныя ўзроўні часцінак заселены больш, чым нізкія (т.зв. інверсная заселенасць). Вымушанае выпрамяненне А.а. выкарыстоўваецца для ўзмацнення і генерацыі эл.-магн. хваляў (гл. *Квантавы ўзмацняльнік, Квантавы генератар*). 2) У оптыцы — рэчыва, якому ўласцівая натуральная *аптычная актыўнасць*.

**АКТЫ́ЎНАСЦЬ** (ад лац. activus дзейсны, дзейны) у псіхалогіі, уласцівасць псіхікі быць не толькі актам, але і крыніцай паводзін. Праяўляецца ў сувязі з дзейнасцю як дынамічная ўмова яе ўзнікнення, рэалізацыі і відазмянення. Паняццем «А.» падкрэсліваецца не рэактыўная, а актыўная сутнасць псіхічнага, якая найлепш праяўляецца праз свабоду волі і жадання. А. можа быць вонкавая (праяўляецца праз рухі цела і маторыку) або ўнутраная (існуе ў плыні псіхічнага). У ёй вылучаюць паводзіны і дзейнасць. Дзейнасць адрозніваецца ад паводзін тым, што выклікаецца свядома пастаўленымі мэтамі, якія дасягаюцца пры дапамозе прылад працы. Тэрмін «А.» выкарыстоўваецца псіхолагамі і ў вузкім сэнсе:

А. асобы — магчымасць чалавека быць суб'ектам міжасабовых зносін, дзейнасці і самарэалізацыі; А. надсітуацыйная звязана з перавышэннем зададзеных мэт дзейнасці, а звышнарматыўная А. — з перавышэннем звычайных нормаў дзейнасці; А. пошукавая — перабор розных варыянтаў сітуацыі дзеяння. Тэрмінам «А.» называюць таксама аспект тэмпераменту, які характарызуецца хуткасцю, тэмпам, энергіяй, магчымасцю пераадольваць цяжкасці.

*Літ.*: Хекхаузен Х. Мотивация и деятельность: Пер. с нем. М., 1986. [Т.]1. С. 12—14, 54—55, 70—93, 152—160, 215, 216; Общая психология. 2 изд. М., 1986. С. 205—215, 415. *Т.У.Васілец.*

**АКТЫ́ЎНАСЦЬ**, 1) у хіміі, А. каталізатара — здольнасць паскараць хім. рэакцыю. Вызначаецца як скорасць рэакцыі ў дадзеных умовах без уліку скорасці той жа рэакцыі пры адсутнасці каталізатара. Паверхневая А. — здольнасць рэчыва пры адсорбцыі зніжаць *паверхневае нацяжэнне* на мяжы падзелу дзвюх фазаў. Вызначаецца велічынёй — $\frac{\partial \sigma}{\partial c}$, дзе σ — каэфіцыент паверхневага нацяжэння, с — аб'ёмная канцэнтрацыя рэчыва. Уласцівая *паверхнева-актыўным рэчывам*. 2) У хімічнай тэрмадынаміцы — велічыня, якая адпавядае тэрмадынамічным уласцівасцям рэчыва ў рэальным растворы. Вызначаецца праз змену пэўных фіз. велічыняў (пругкасці пары, т-ры замярзання, кіпення і інш.) пры змене кан-

цэнтрацыі рэчываў у растворах. Адхіленне ўласцівасцяў рэальнага раствору ад уласцівасцяў ідэальнага характарызуецца каэфіцыентам А. (адносінай А. да канцэнтрацыі). 3) У ядзернай фізіцы — велічыня, роўная колькасці радыеактыўных распадаў за адзінку часу; адна з асн. характарыстык *радыеактыўнасці*. Адзінка А. ў СІ — *бекерэль*, пазасістэмная адзінка — *кюры*.

**АКТЫ́ЎНАЯ ЗО́НА** ядзернага рэактара, прастора ядзернага рэактара, дзе ў выніку *ланцуговай ядзернай рэакцыі* выдзяляецца энергія (пераважна ў выглядзе цяпла). А.з. мае: рэчыва, якое дзеліцца (часцей за ўсё ў выглядзе блокаў ці стрыжняў); запавольнік, калі рэакцыя ідзе на павольных нейтронах; цепланосьбіт для адводу цяпла; прылады і прыстасаванні сістэм кіравання, кантролю і аховы рэактара. Як запавольнік выкарыстоўваюцца вада, цяжкая вада, графіт, берылій і інш., як цепланосьбіт — вада, вадзяная пара, цяжкая вада, арган. вадкасці, гелій, вуглякіслы газ, вадкія металы (пераважна натрый). Для памяншэння ўцечкі нейтронаў А.з. акружаецца адбівальнікам нейтронаў (з тых жа рэчываў, што і запавольнік). Форма А.з. цыліндрычная.

*Літ.*: Петросьянц А.М. Ядерная энергетика. 2 изд. М., 1981; Красин А.К., Красина Р.Ф. Мирное использование ядерной энергетики (физ. основы). Мн., 1982.

*Р.М.Шахлевіч.*

**АКТЫ́ЎНАЯ ЛЕ́КСІКА**, частка слоўнікавага складу сучаснай мовы, якая свабодна ўжываецца ў штодзённых зносінах ва ўсіх сферах грамадскага жыцця. Проціпастаўляецца *пасіўнай лексіцы*. Ал. ўключае агульнаўжывальныя словы і тэрміны, прафесіяналізмы, эмацыянальна-экспрэсіўную лексіку і інш. Паза межамі яе знаходзяцца *архаізмы* і *неалагізмы*. У працэсе развіцця грамадства і мовы словы могуць пераходзіць з Ал. ў пасіўную і наадварот. Ад Ал. мовы неабходна адрозніваць Ал. асобнага носьбіта мовы, якая залежыць ад яго прафесіі, адукацыі і інш. *П.П.Шуба.*

**АКТЫ́ЎНАЯ МАГУ́ТНАСЦЬ**, сярэдняе за перыяд значэнне імгненнай магутнасці пераменнага току. Вызначаецца

$$\langle P\rangle = \frac{1}{T}\int_0^T p\,dt$$

, дзе T — перыяд, p — імгненная магутнасць. Характарызуе скорасць пераўтварэння электрамагн. энергіі ў інш. віды энергіі (цеплавую, светлавую, мех. і г.д.). Для эл. ланцуга аднафазнага (сінусаідальнага) току $\langle P\rangle = U \cdot I \cdot \cos\varphi$, для трохфазнага пры сіметрычнай нагрузцы $\langle P\rangle = \sqrt{3} \cdot U \cdot I \cdot \cos\varphi$, дзе U, I — дзейныя значэнні напружання і току адпаведна, φ — вугал зруху фаз паміж U і I, cos φ — *каэфіцыент магутнасці*. З поўнай магутнасцю S А.м. звязана суадносінамі $\langle P\rangle = S \cdot \cos\varphi$. Адзінка вымярэння А.м. — *ват* (вт).

**АКТЫ́ЎНАЯ ТУРБІ́НА**, турбіна, у якой унутраная (патэнцыяльная) энергія рабочага цела (газу, пары, вадкасці) пераўтвараецца ў знешнюю (кінетычную) у нерухомых соплавых прыстасаваннях. Далейшае пераўтварэнне кінетычнай энергіі ў энергію вярчэння ротара адбываецца толькі ў выніку змены напрамку руху рабочага цела на лапатках турбіны. У А.т. ціск патоку газу (пары, вадкасці) на ўваходзе і выхадзе з рабочага кола аднолькавы. Гл. таксама *Рэактыўная турбіна*.

**АКТЫ́ЎНАЯ ТЭМПЕРАТУ́РА** паветра, тэмпература паветра, якая перавышае біялагічны мінімум на працягу ўсяго перыяду вегетацыі якой-н. расліны або на працягу пэўнай фазы яе развіцця. Вызначае межы пашырэння кожнай раслінай культуры. Сумы А.т. вышэй за 5, 10 і 15 °С звычайна вы-

**Актыўная зона** ядзернага рэактара: 1 — стрыжань з паглынальнымі элементамі рэгулявання; 2 — стрыжань з паглынальнымі элементамі аварыйнай аховы; 3 — цеплавыдзяляльны элемент; 4 — запавольнік нейтронаў; 5 — цепланосьбіт; 6 — адбівальнік нейтронаў; 7 — цыркуляцыйны контур цепланосьбіта.

карыстоўваюцца як агракліматычныя паказчыкі для вызначэння патрэб у цяпле большасці раслін і для ацэнкі тэрмічных рэсурсаў тэрыторыі. Перыяд з т-рамі вышэй за 10 °С забяспечвае актыўную вегетацыю большасці с.-г. культур умеранага пояса. На тэр. Беларусі сума т-р паветра вышэй за 10 °С паступова памяншаецца (у °С) з Пд і ПдЗ на ПнУ прыкладна ад 2600 да 2100, вышэй за 5 °С — ад 2900 на ПдЗ да 2400 на крайнім ПнУ, за 15 °С — прыкладна ад 1900 на ПдЗ да 1350 на ПнУ.

**АКТЫ́ЎНЫ ВУ́ГАЛЬ**, актываваны вугаль, вугляродны *адсарбент*, з развітой сітаватай структурай. Добра адсарбіруе арган. рэчывы, дрэнна аміяк, ваду, спірт. Адсорбцыя ў мікрасітавінах (памер 3 нм, аб'ём да 0,6 $см^3/г$) адбываецца па механізме аб'ёмнага запаўнення, у мезасітавінах (3—200 нм, аб'ём да 0,5 $см^3/г$) — капілярнай кандэнсацыі; макрасітавіны (200 нм, аб'ём да 1,2 $см^3/г$) выконваюць трансп. функцыю. Атрымліваюць з выкапнёвага ці драўнянага вугалю парафазавай ці хім. карбанізацыяй і актывацыяй, а таксама тэрмічным раскладаннем сінт. палімераў. Выкарыстоўваецца для рэкуперацыі арган. растваральнікаў, пры рафінаванні цукру, ачыстцы пітной вады, спіртных напіткаў, сцёкавых водаў, як адсарбент і носьбіт каталітычных дабавак, у медыцыне для ачысткі крыві і паглынання шкодных рэчываў у страўнікава-кішачным тракце.

**АКТЫ́ЎНЫ КАПІТА́Л**, капітал, свабодны ад абавязацельстваў і даўгоў.

**АКТЫ́ЎНЫ КО́МПЛЕКС** у хіміі, гл. *Пераходны стан*.

**АКТЫ́ЎНЫ ЎЧА́СТАК** у касманаўтыцы, адрэзак траекторыі палёту касм. лятальнага апарата, калі працуюць ракетныя рухавікі. Заканчваецца звычайна ў месцы, дзе касм. аб'ект аддзяляецца ад ракеты-носьбіта і выходзіць на зададзеную траекторыю руху. У залежнасці ад месца старту палёт касм. апарата можа складацца з чаргавання А.у. з пасіўнымі (без работы ракетных рухавікоў).

**АКТЫ́ЎНЫ ЦЭ́НТР** у біяхіміі, участак у малекулах ферментаў, які непасрэдна ўзаемадзейнічае з субстратам. У А.ц. уваходзяць функцыянальныя групы бакавых ланцугоў некаторых амінакіслот (гістыдзіну, цыстэіну, серыну і інш.), а таксама атамы металаў і кафермента. Утвараецца ў бялковай малекуле ў выніку збліжэння пэўных участкаў поліпептыднага ланцуга. А.ц. з'яўляюцца таксама ўчасткі малекул антыцелаў, якія звязваюцца з бактэрыямі, вірусамі і інш. антыгенамі.

**АКТЭ́Т** (італьян. ottetto ад лац. octo восем) у музыцы, 1) ансамбль з 8 выканаўцаў — інструменталістаў ці вакалістаў. Складаецца спецыяльна для выканання пэўных твораў, часам устойлівы калектыў. 2) Муз. твор для 8 салістаў-інструменталістаў (найчасцей камерныя творы ў санатнай цыклічнай форме) ці для 8 пеўчых галасоў.

**АКУАРЫІДО́ЗЫ**, інвазійныя хваробы (гельмінтозы) свойскіх і дзікіх птушак, якія выклікаюцца нематодамі сям. Acuariidae, што паразітуюць у страваводзе і страўніку курэй, індыкоў, цацарак, фазанаў. Прамежкавыя гаспадары нематод — членістаногія. Пашыраны эхінурыёз, дыскарынксоз, стрэптакароз, хейласпіруроз.

**АКУДЖА́ВА** Булат Шалвавіч (н. 9.5.1924, Масква), расійскі пісьменнік, аўтар і выканаўца песень. Скончыў Тбіліскі ун-т (1950). Аўтар зб-каў вершаў «Лірыка» (1956), «Астравы» (1959), «Вясёлы барабаншчык» (1964), «Арбат, мой Арбат» (1976), «Песні і вершы» (1989), «Дары лёсу» (1993) і інш. Для іх характэрна зліццё размоўнай і песеннай інтанацый, празаізмаў і патэтыкі. Стваральнік своеасаблівага выканаўчага стылю — аўтарскай песні («Возьмемся за рукі, сябры», «Лёнька Каралёў», «Паўночны тралейбус», «Ах, Арбат, мой Арбат...» і інш.). Напісаў раманы «Па-

дарожжа дылетантаў» (кн. 1—2, 1976—78), «Спатканне з Банапартам» (1983), «Скасаваны тэатр» (1994); аповесці «Будзь здаровы, шкаляр» (1961), «Бедны Аўросімаў» (1969), «Паходжанні Шыпава, ці Старадаўні вадэвіль» (1971).

*Тв.*: Избр. произв. Т. 1—2. М., 1989; Милости судьбы: [Новые стихи]. М., 1993.

**АКУ́ЛА** Кастусь (сапр. Качан Аляксандр Ігнатавіч; н. 16.11.1925, в. Верацеі Докшыцкага р-на Віцебскай вобл.), празаік, паэт, драматург. Піша на бел. і англ. мовах. Вучыўся ў Віленскай бел. гімназіі. У чэрв. 1944 паступіў у Мінскую школу камандзіраў Бел. краёвай абароны і з ёю пакінуў Мінск. Са жн. 1944 у франц. Супраціўленні, са снежня — у Брытанскай 8-й арміі ў Італіі (2-і польскі корпус). За ўдзел у баях супраць немцаў узнаг. залатой «Зоркай Італіі». З 1947 у Канадзе. У Таронта арганізаваў *Згуртаванне беларусаў Канады* (1948, першы яго старшыня), рэдагаваў газ. «Беларускі эмігрант» (1948—54). Рэдагуе час. бел. ветэранаў «Зважай». У трылогіі «Гараватка» («Дзярлівая птушка», 1965; «Закрываўленае сонца», 1974; «Беларусы, вас чакае зямля», 1981) праз гісторыю бел. вёскі з сімвалічнай назваю Гараватка імкнуўся паказаць гіст. лёс Беларусі — гераічнай і мужнай краіны, якая здолела вытрымаць выпрабаванні розных акупацый яе чужынцамі. Раманы «Змагарныя дарогі» (1962), «За волю» (1991) пераважна аўтабіяграфічныя, прысвечаныя лёсу бел. моладзі ў складаных даваен., ваен. і паслявасн. умовах на Беларусі і за мяжою, яе шляху да нац. самасвядомасці. У зб. «Усякая ўсячына» (Таронта, 1984) увайшла проза, паэзія, драматургія А., яго аўтабіягр. абразкі.

*Тв.*: Змагарныя дарогі. Мн., 1994.

*Літ.*: Арлоў У. Беларус з берагоў Антарыё // Полымя. № 6. 1994. *С.Б.Сачанка.*

**АКУ́ЛАЎ** Валянцін Леанідавіч (н. 31.1.1936, в. Троіцкае Бесарабскага р-на, Малдова), філосаф. Д-р філас. н. (1984), праф. (1985). Скончыў Кішынёўскі ун-т (1960). Настаўнічаў, працаваў у Кішынёўскім ін-це мастацтваў, Краснадарскім політэхн. ін-це і інш. З 1979 у Мінскім лінгвістычным ун-це (з 1983 заг. кафедры філасофіі і логікі). Працы па праблемах анталогіі і тэорыі пазнання, эстэтыкі, філасофіі права: «Філасофія, яе прадмет, структура і месца ў сістэме навук» (1976), «Дыялектычны матэрыялізм як сістэма (Спроба тэарэтычнага аналізу)» (1986), «Матэрыялістычны манізм: сутнасць і метадалагічнае значэнне» (1988) і інш.

**АКУ́ЛАЎ** Герасім (Гераська), разьбяр па дрэве 17 ст. Нарадзіўся ў г. Дуброўна Віцебскай вобл. Майстэрству разьбы вучыўся ў Куцеінскім Богаяўленскім манастыры пад Оршай. З 1654 працаваў у Іверскім (пад Ноўгарадам), з 1658 у Нова-Іерусалімскім (пад Масквой) манастырах. У 1666 пераведзены ў Аружэйную палату Маскоўскага Крамля. У 1667—68 удзельнічаў у аздабленні царскага Каломенскага палаца. Адзін са стваральнікаў разьбяных іканастасаў 3 цэрквяў у Ізмайлаўскай сядзібе цара Аляксея Міхайлавіча. У 1686 удзельнічаў у стварэнні іканастаса царквы Пятра і Паўла ў Маскве.

**АКУ́ЛАЎ** Мікалай Сяргеевіч (25.12.1900, г. Арол — 21.9.1976), бел. фізік. Акад. АН Беларусі (1940), д-р фізіка-матэм. н., праф. (1935). Скончыў Маскоўскі ун-т (1926). У 1931—54 у Маскоўскім ун-це. З 1959 у Фізіка-тэхн. ін-це, у 1963—67 заг. Аддзела фізікі неразбуральнага кантролю АН Беларусі. У 1928 сфармуляваў закон анізатрапіі, які ўстанаўлівае сувязь паміж магн. і мех. ўласцівасцямі ферамагнетыкаў. Аўтар прац па тэорыі хім. дынамікі і ланцуговых працэсаў, стат. тэорыі дыслакацыі, тэорыі пластычнасці і трываласці. Прапанаваў метады аналізу ферасплаваў і спосабы выяўлення дэфектаў у метал. вырабах. Дзяржаўная прэмія СССР 1941, Дзяржаўная прэмія Беларусі 1976.

*Тв.*: Ферромагнетизм. М.; Л., 1939; Основы химической динамики. М., 1940; Теория цепных процессов. М.; Л., 1951; Дислокации и пластичность. Мн., 1961.

*Літ.*: Н.С.Акулов // Весці АН БССР. Сер. фізіка-тэхн. навук. 1976. № 4.

**АКУЛЕ́ВІЧ** Павел Антонавіч (вер. 1896 — 1.3.1979), бел. казачнік з в. Старыя Прыборкі Бярэзінскага р-на Мінскай вобл. Расказваў гумарыстычныя і сатыр. казкі і анекдоты сюжэтных тыпаў «Дзе чорт не зможа, туды бабу пашле», «Салдат гатуе кашу з сякеры», «Скупы поп і парабак» і інш. Выкарыстоўваў рыфмаваныя традыц. казачныя формулы, дыялогі, рабіў свае імправізацыі. Расказваў чарадзейныя казкі «Ілья Мурамец», «Бава Каралевіч». Выконваў свае вершаваныя гумарыстычныя апавяданні ў стылі «гутарак» пра розныя падзеі мясцовага жыцця: «Як сенакос дзялілі», «Як у суседа банкетавалі». Казкі А. зберагаюцца ў архіве Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі.

**АКУЛЕ́ВІЧ** Рыгор Раманавіч (19.4.1907, в. Вял. Кракотка Слонімскага р-на Гродзенскай вобл. — 28.10.1974), удзельнік рэв. і нац.-вызв. руху ў Зах. Беларусі, дзеяч бел. эміграцыі. Адзін з арганізатараў гурткоў Бел. сялянска-работніцкай грамады і Т-ва бел. школы, б-кі імя Я.Купалы на радзіме. Каб пазбегнуць арышту, у 1928 эмігрыраваў у Канаду. Удзельнічаў у выпуску газ. «Канадский гудок», якая мела бел. старонку. Адзін са стваральнікаў Федэрацыі рус. канадцаў і яе друкаванага органа газ. «Вестник». Аўтар кн. «Рускія ў Канадзе» (Таронта, 1952), брашуры «50 год Беларускай рэспублікі» (Таронта, 1968).

**АКУЛЁНАК** Пётр Сяргеевіч (н. 22.7.1910, в. Вял. Мяхінічы Талачынскага р-на Віцебскай вобл.), бел. балетмайстар. Засл. дз. маст. Беларусі (1960). Скончыў курсы культасветработнікаў у Магілёве (1932). З 1937 саліст Ансамбля песні і танца Бел. філармоніі, у ансамблях песні і танца Адэскай і Прыбалтыйскай ваен. акруг. У 1953—73 гал. балетмайстар Дзярж. нар. хору БССР. Сярод пастановак: «На прывале», «Лянок», «Калгасная полька», «Лявоніха», «Мяцеліца», «Беларуская маладзёжная» і інш. Работы А. — яркі прыклад узаемаўзбагачэння нар. і прафес. харэагр. мастацтва.

**АКУ́ЛІН** Эдуард Аляксандравіч (н. 7.1.1963, в. Вял. Нямкі Веткаўскага р-на

Б.Ш.Акуджава.

Гомельскай вобл.), бел. паэт. Скончыў Гомельскі ун-т (1984). Настаўнічаў. З 1990 заг. філіяла Літ. музея М.Багдановіча ў Мінску. Аўтар зб. «Пяшчота ліўня» (1990), «Крыло анёла» (1995). Актуальнасць праблематыкі, лірызм, задушэўнасць — асн. рысы яго паэзіі. Паэма «Шлях да радзімы» прысвечана памяці М.Багдановіча. Аўтар і выканаўца песень на свае вершы і музыку.

**АКУЛІ́НІН** Аркадзь Андрэевіч (16.5.1909, с. Вял. Лазаўка Токараўскага р-на Тамбоўскай вобл., Расія — 1986), бел. вучоны ў галіне ветэрынарыі. Д-р біял. н. (1959), праф. (1960). Скончыў Варонежскі зоавет. ін-т (1932) і Ленінградскі вет. ін-т (1935). З 1947 у Віцебскім вет., з 1969 у Гродзенскім с.-г. ін-тах. Асн. працы па мікра- і макраскапічнай будове вегетатыўнай нерв. сістэмы свойскай жывёлы.

**АКУЛІРО́ЎКА** (ад лац. oculus вока), спосаб прышчэплівання раслін роставай пупышкай (вочкам). Найб. пашыраны спосаб размнажэння многіх пладовых дрэў. Спячым вочкам часцей за ўсё прышчэпліваюць сеянцы дзікіх відаў і культурных сартоў. А. патрабуе найменшага расходу прышчэпачнага матэрыялу і забяспечвае адносна высокую прыжывальнасць прышчэпак. Прышчэпа прыдатная да А. ў час летняга руху сокаў (ліпень—жнівень), калі ў раслін добра адстае кара. У першую чаргу акуліруюць костачкавыя культуры, потым грушу, насенныя прышчэпы яблыні і апошнімі — клонавыя прышчэпы.

**АКУ́ЛІЧ** Аляксандр Канстанцінавіч (27.1.1888, в. Стары Мазалаў Рагачоўскага р-на Гомельскай вобл. — 13.5.1961), ваен. дзеяч. Генерал-лейтэнант (1940). З 1915 у арміі, з 1917 у Чырв. гвардыі, з 1918 у Чырв. Арміі.

Удзельнік Кастр. рэвалюцыі і грамадз. вайны: старшыня палкавога ВРК, камандзір палка, нач. штаба, камандзір брыгады. У Вял. Айч. вайну з 1941 камандзір дывізіі на Волхаўскім фронце, удзельнік абароны Ленінграда. Да 1946 у Сав. Арміі.

**АКУ́ЛІЧ** Уладзімір Лявонцьевіч (2.4.1904, г. Радвілішкіс, Літва — 17.12.1972), бел. кінааператар. Засл. дз. маст. Беларусі (1955). Скончыў тэхнікум кінематаграфіі (Адэса, 1928). З 1947 на кінастудыі «Беларусьфільм». Зняў маст. фільмы «Палеская легенда» (1957), «Гадзіннік спыніўся апоўначы» (1958), «Рагаты бастыён» (1965) і інш., сюжэты для кіначасопісаў і навук.-папулярных фільмаў, кінанарысы, дакумент. фільмы. Аператар-пастаноўшчык тэлевіз. маст. фільма «Побач з вамі» (1967).

**АКУ́ЛЫ** (Selachomorpha), надатрад пласцінашчэлепных рыб. Аб'ядноўвае 8 атр., каля 250 відаў. Пашыраны ва ўсіх акіянах, большасць у трапічных морах, некаторыя ў рэках (Ганг, Амазонка). Найб. старажытныя з рыб, вядомы з сярэдзіны дэвону.

Цела А. верацёнападобнае, ад 20—30 см у некат. куніцавых (Triakidae) і катранавых (Squalidae) да 20 м (масай да 14 т) у гіганцкай (Cetorhinus maximus) і кітовай (Rhincodon typus). Луска плакоідная. Хваставы плаўнік магутны, гетэрацэркальны. Па баках галавы 5 (зрэдку 6—7) шчэлепных адтулін. Рот ніжні, зубы добра развітыя. Шкілет храстковы, плавальнага пузыра няма. Большасць драпежнікі (асобныя нападаюць на чалавека), некаторыя планктонафагі. Жыва-, яйцажыва- або яйцанараджальныя. Плоднасць ад 2 да 100 эмбрыёнаў. Аб'екты промыслу.

**АКУЛЬТУРА́ЦЫЯ**, працэс і вынік узаемаўплыву культур; успрыманне адной з іх элементаў і каштоўнасцяў іншай. Як спецыфічны аб'ект даследавання вылучылася ў 2-й пал. 19 ст. ў працах англ. і амер. этнографаў і сацыёлагаў. Ф.Боас, М.Мід, Б.Маліноўскі, Р.Рэдфілд і інш. вучоныя вылучалі ў А. донарскія і рэцыпіентныя групы ў культурным кантэксце (пераважна на прыкладзе ўздзеяння «белай» амер. культуры на індзейцаў, неграў, мексіканцаў, якія жывуць у ЗША). Было выяўлена, што рэцыпіентная культура ажыццяўляе адбор культ. каштоўнасцяў праз прызму сваіх своеасаблівасцяў, пры гэтым адны з іх адаптуе, другія адштурхоўвае. Праблема А. набывае актуальнасць у сувязі з працэсам нац.-культ. адраджэння Беларусі і неабходнасцю больш глыбокага вызначэння самабытнасці і своеасаблівасці культуры бел. народа, на якую моцна паўплывалі працэсы паланізацыі і русіфікацыі, а таксама ўзаемадзеяння яе з культурамі народаў Расіі, Польшчы, Літвы і інш.

*Літ.*: Бахта В.М. Проблема аккультурации в современной этнографической литературе США // Современная американская этнография. М., 1963. *Я.М.Бабосаў.*

**АКУЛЬТУ́РВАННЕ ГЛЕ́БЫ**, павышэнне ўрадлівасці глебы з дапамогай агратэхн., аграхім. і меліярац. мерапрыемстваў. Акультуруюць паглыбленнем воранага гарызонту, сістэм. апрацоўкай, угнойваннем, вапнаваннем або гіпсаваннем, рэгуляваннем воднага рэжыму. Праводзяць на глебах з нізкай прыроднай урадлівасцю. Ва ўмовах Беларусі водны рэжым рэгулююць *асушэннем* і *арашэннем*, адвядзенне паверхневых водаў, баразнаваннем, рыхленнем падворнага гарызонту, унясеннем мікраўгнаенняў, увядзенне севазваротаў з шматгадовымі травамі. Глебы, схільныя да воднай і ветравой эрозіі, аруць упоперак схілаў, на іх робяць перарывістае баразнаванне, залужэнне, садзяць ляснyя палосы і інш. На землях, парушаных у выніку с.-г. работ, праводзіцца рэкультывацыя, ствараецца новы ворны гарызонт.

*Літ.*: Кулаковская Т.Н. Почвенно-



Акуліроўка: *а* — паўмесяцавы надрэз кары прышчэпы; *б* — падоўжны разрэз кары; *в* — пачатак зрэзу шчытка з пупышкай; *г* — размяшчэнне шчытка пад кару; *д* — абцісканне кары пасля размяшчэння шчытка; *е* — пачатак абвязкі; *ж* — паслядоўнасць абвязкі.

агрохимические основы получения высоких урожаев. Мн., 1978.

**АКУЛЬТЫ́ЗМ** (ад лац. occultus патаемны, скрыты), агульная назва ідэаліст. вучэнняў і поглядаў, што прызнаюць існаванне звышнатуральных, не даступных навук. даследаванню феноменаў і сіл у чалавеку і космасе. Да акультных вучэнняў адносяць магію, астралогію, спірытызм, тэасофію, парапсіхалогію, тэлепатыю, ёга і інш. У філас. плане блізкі да *гілазаізму* і *пантэізму*. Вядомы з часоў антычнасці. На розных этапах развіцця культуры быў у складаных узаемаадносінах з навукай, філасофіяй, рэлігіяй, мастацтвам.

Акулы: 1 — анёл; 2 — рыба-молат; 3 — сіняя акула.

**АКУЛЯ́Р** (ад лац. ocularis вочны), частка аптычнай прылады (мікраскопа, тэлескопа і інш.), накіраваная да вока назіральніка. Прызначаны для разглядання павялічанага відарыса, створанага аб'ектывам або абарачальнай сістэмай. Асн. характарыстыкі: фокусная адлегласць, якая вызначае павелічэнне ўсёй аптычнай сістэмы; адлегласць да выхаднoй зрэнкі (ад апошняй паверхні А. да відарыса, створанага акулярам); вугал поля зроку. Асн. тыпы простых А.: Гюйгенса (17 ст.) і Рамсдэна (18 ст.). У складаных А. за кошт павелічэння колькасці лінзаў і выкарыстання несферычных (напр., парабалічных) паверхняў вугал зроку даводзіцца да 90—100°.

**АКУЛЯ́РЫ**, найбольш простае аптычнае прыстасаванне, якое выкарыстоўваецца для карэкцыі недахопаў аптычнай сістэмы вока або засцерагае яго ад мех. пашкоджанняў, уздзеяння агрэсіўных вадкіх і газападобных асяроддзяў, прамянёў святла. Складаюцца з дзвюх акулярных лінзаў (карэгавальныя А.) або спец. шкла (засцерагальныя А.) і аправы, якая забяспечвае неабходнае становішча лінзаў або шкла адносна вачэй. Разнавіднасцю А. можна лічыць кантактныя лінзы. Робяць іх з гнуткага празрыстага шкла і прыкладаюць непасрэдна да рагавіцы або склеры вока. Найб. пашырэнне маюць А., прызначаныя для паляпшэння зроку пры *блізарукасці* (міяпіі) і *дальназоркасці* (гіперметрапіі).

**АКУЛЯ́РЫ ПАЛЯРО́ІДНЫЯ**, акуляры паляризацыйныя, акуляры, у аправу якіх устаўлены паляризацыйныя святлафільтры (*паляроіды*). Прызначаны для паасобнага назірання *стэрэапары* абодвума вокамі (кожнае вока бачыць толькі тую выяву стэрэапары, якая прызначана для гэтага вока). Выкарыстоўваюць для прагляду чорна-белых і каляровых стэрэаскапічных фотавыяў і кінафільмаў, якія праецыруюцца праз палярызацыйныя святлафільтры.

**АКУМЕ́ТРЫЯ**, гл. *Аўдыяметрыя.*

**АКУМУЛЯ́ТАР**, прыстасаванне для назапашвання (акумуляцыі) энергіі з мэтай далейшага яе выкарыстання. У залежнасці ад віду энергіі адрозніваюць А.: гідраўлічныя, механічныя (інерцыйныя), паравыя, пнеўматычныя, цеплавыя, электрычныя.

Гідраўлічны А. назапашвае энергію рабочай вадкасці, што знаходзіцца пад ціс-

кам. Выкарыстоўваецца для выраўноўвання ціску і расходу вадкасці ці газу з рэзкапераменнай нагрузкай. Бываюць грузавыя, спружынныя, з пруткім корпусам, а таксама пнеўмагідраакумулятары поршневыя, мембранныя, балонныя. Інерцыйны А. звычайна складаецца з масіўнага махавіка, вала, падшыпнікаў і кажуха. Мае мінім. страты энергіі на трэнне і супраціўленне паветра. Выкарыстоўваецца ў ветраэл. станцыях для выраўноўвання абаротаў генератара, прывода аўтаматрыс і аўтобусаў (гіробусаў), у прэсавым абсталяванні і інш. Паравы А. — стальны бак, у якім назапашваецца адпрацаваная ў розных паравых машынах (напр., у паравым молаце) пара без змены агрэгатнага стану, якая затым расходуецца на тэхнал. мэты (напр., у сушыльных і прапарачных камерах) ці ў сан.-тэхн. прыстасаваннях (падагравальніках, цеплаабменніках і інш.). Пнеўматычны А. — рэсервуар са сціснутым паветрам (ці інш. газам), падключаны да паветравода і абсталяваны засцерагальным клапанам, які рэгулюецца на зададзены гранічны ціск. Выкарыстоўваецца ў пнеўматычных сетках для выраўноўвання рабочага ціску і інш. Цеплавыя А. (пастаяннага і пераменнага ціску) — пераважна паравадзяныя, назапашваюць цеплату ў цепласілавых установуках. Служаць для выраўноўвання цеплавых і сілавых нагрузак і недапушчэння перабояў у забеспячэнні парай прамысл. установак. Найб. пашыраны *электрычны акумулятар*.

**АКУМУЛЯТЫЎНЫЯ РАЎНІНЫ**, намыўныя раўніны, наносныя раўніны, выраўнаваныя паверхні, утвораныя ў выніку працяглага намнажэння (акумуляцыі) рыхлых асадкавых горных парод рознага паходжання. Адрозніваюць марскога (раўніны марской акумуляцыі, або першасныя), рачнога (алювіяльныя), азёрнага (азёрныя), ледавіковага (марэнныя, флювіягляцыяльныя, або зандравыя, раўніны) паходжання; вылучаюць таксама падводныя А.р. (гл. *Абісальныя раўніны*).

**АКУМУЛЯ́ЦЫЯ** (ад лац. accumulatio намнажэнне, збіранне) у геалогіі, працэс намнажэння на паверхні сушы ці на дне воднага басейна рыхлых мінер. і арган. асадкаў. Вобласць А. — пераважна паніжаныя прасторы тэктанічнага і дэнудацыйнага паходжання. Існуюць 2 асн. тыпы А.: вулканічная і асадкавая (гл. *Седыментацыя, Намнажэнне асадкаў*). У залежнасці ад геал. фактараў адрозніваюць А. наземную і падводную. У выніку А. ўтвараюцца вулканічныя горныя пароды і разнастайныя формы акумуляцыйнага рэльефу, паклады многіх відаў карысных выкапняў, на Беларусі, напр., торфу, сапрапеляў, вапняку, калійных соляў, галіту і інш.

**АКУМУЛЯ́ЦЫЯ ЗАБРУ́ДЖВАЛЬНЫХ РЭ́ЧЫВАЎ** у арганізмах, назапашванне ў жывых істотах хім. рэчываў, якія забруджваюць навакольнае асяроддзе. Месцам акумуляцыі могуць быць розныя органы і тканкі, пры гэтым многія з забруджвальнікаў (асабліва біягеннага паходжання) здольныя паступова часткова ці цалкам утылізавацца праз уключэнне ў біяхім. цыклы арганізма; у такім выпадку шкоднасць іх (напр., *нітратаў*) выяўляецца не абавязкова ў самім арганізме-назапашвальніку. Стойкія забруджвальнікі дрэнна ўключаюцца ў цыкл натуральнага кругавароту рэчываў і працяглы час захоўваюцца і ў навакольным асяроддзі і ў арганізмах, якія іх акумулююць. У працэсе руху па *трафічных ланцугах* яны могуць ствараць значна большыя канцэнтрацыі — аж да асабліва небяспечных для існавання асобных відаў жывёл і раслін, а таксама для здароўя чалавека. Прыкладам такой А.з.р. з'яўляецца назапашванне ядахімікатаў (ДДТ і некат. інш. *пестыцыдаў*), многіх *радыенуклідаў* (стронцый-90), *цяжкіх металаў* і інш. Для Беларусі праблема А.з.р. вельмі абвастрылася пасля стварэння на яе тэр. буйных комплексаў хім. прам-сці і асабліва ў сувязі з яе радыеактыўным забруджваннем у выніку аварыі на Чарнобыльскай АЭС.




Да арт. **Акуляр**: *а* — акуляр Гюйгенса; *б* — акуляр Рамсдэна; *Л1, Л2* — лінзы; *Д* — дыяфрагма; *F* — пярэдняя факальная плоскасць; *В* — вока.




Гідраўлічны **акумулятар**: *а* — грузавы; *б* — балонны; 1 — рэзервуар; 2 — поршань; 3 — груз; 4 — балоны са сціснутым паветрам.

**АКУНЕПАДО́БНЫЯ** (Perciformes), самы шматлікі атр. касцістых рыб. Уключае 21 падатр., 150 сям., каля 1200 родаў, 6,5 тыс. марскіх і прэснаводных відаў (каля 40% ад агульнай колькасці ўсіх відаў рыб). У вадаёмах Беларусі 4 віды сям. акунёвых (*акунь звычайны, судак*, джгір звычайны, джгір-насар), па аднаму віду бычковых (бычок-пясчанік) і падкаменшчыкавых (*падкаменшчыкі*).

Даўж. 1 см—5 м, маса ад доляў грама да 900 кг. Маюць звычайна 2 спінныя плаўнікі з калючкамі; брушныя плаўнікі складаюцца з прамянёў (не болей як 6) і знаходзяцца пад грудзьмі або наперадзе іх. Плавальны пузыр не злучаны з кішэчнікам. Луска найчасцей ктэноідная. Ёсць шыпы на галаве, верхнія і ніжнія рэбры. А. з'явіліся ў верхнім меле, большасць сямействаў вядома з эацэну. Многія А. — каштоўныя прамысл. рыбы, шэраг відаў разводзіцца ў акварыумах.

Акунь звычайны.

**АКУНЁВА**, возера ў Беларусі, у Глыбоцкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Мнюта. Пл. 0,49 км², даўж. 0,97 км, найб. шыр. 0,6 км, найб. глыб. 11,8 м, даўж. берагавой лініі 2,7 км. Пл. вадазбору 1,4 км². Схілы выш. да 4 м, на ПдУ да 10—11 м. Берагі нізкія, пясчаныя і галечныя, на Пн і ПнУ тарфяністыя, дно пясчанае, глыбей за 2 м глеістае. Злучана меліярац. каналам з воз. Пліса. На зах. і паўн.-зах. схілах крыніцы грунтавых водаў.

**АКУНЁЎКА**, вёска ў Беларусі, у Гарадзішчанскім с/с Шклоўскага р-на Магілёўскай вобл., на р. Аўчоса. Цэнтр саўгаса «Юбілейны». За 20 км на У ад Шклова, 40 км ад Магілёва, 23 км ад чыг. ст. Шклоў. 355 ж., 177 двароў (1995). Базавая школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі.

**АКУ́НІНА**, возера ў Беларусі, у Іванаўскім р-не Брэсцкай вобл., у бас. р. Піна. Пл. 0,23 км². Даўж. 0,94 км, найб. шыр. 0,31 км, найб. глыб. 11,8 м. Пл. вадазбору каля 3 км². Схілы нізкія, на З і Пд парослыя лесам, на У забалочаныя. Берагі пясчаныя, на Пд тарфяністыя. Праз Завішчанскі канал злучана з Завішчанскім возерам.

**АКУ́НЬ ЗВЫЧА́ЙНЫ** (Perca fluviatilis), азёрна-рачная рыба атр. акунепадобных. Пашыраны ў прэсных і саленаватых вадаёмах Еўразіі. На Беларусі трапляецца амаль ва ўсіх вадаёмах. Малыя А.з. жывуць у затоках, буйныя — на глыбіні.

Даўж. да 55 см, маса да 3 кг. Цела адносна высокае, у буйных — гарбатае, галава вялікая. Трымаецца чародамі. Нерастуе ранняй вясной пры т-ры вады 5—8 °С. Плоднасць да 300 тыс. ікрынак. Моладзь корміцца планктонам, бентасам і маляўкамі рыб. Дарослы А.з. — драпежнік. Аб'ект прамысл. і аматарскага рыбалоўства.

**АКУПА́ЦЫЯ** (ад лац. occupatio захоп) ваенная, у міжнар. праве часовы захоп тэрыторыі адной дзяржавы войскамі другой і ўстанаўленне ваен. адміністрацыі для кіравання ёю. Рэжым А. рэгулюецца 4-й Гаагскай канвенцыяй 1907 пра законы і звычаі сухапутнай вайны, Жэнеўскай канвенцыяй 1949 пра абарону цывільнага насельніцтва ў час вайны і дадатковым пратаколам 1977 да яе. Паводле гэтых пагадненняў акупацыйныя ўлады абавязаны падтрымліваць грамадскі парадак і ствараць нармальныя ўмовы для пражывання насельніцтва. У практыцы 1-й і 2-й сусв. войнаў вядомы шматлікія факты грубага парушэння Германіяй і яе саюзнікамі нормаў міжнар. права, найперш у адносінах да мірнага насельніцтва, якое станавілася аб'ектам жорсткага падаўлення і знішчэння. Рэжым пасляваеннай А. звычайна ўстанаўліваецца спец. міжнар. пагадненнямі зацікаўленых дзяржаў для пэўнай дзяржавы або тэрыторыі з мэтаю выканання ўмоў мірнага дагавору. *Л.В.Паўлава.*

**АКУПУНКТУ́РА**, гл. *Іголкалячэнне.*

**АКУСТАЭЛЕКТРО́НІКА**, раздзел *электронікі*, які вывучае ўзбуджэнне, распаўсюджванне і прыём *акустычных хваляў* у кандэнсаваных асяроддзях, узаемадзеянне іх з электрамагн. палямі і электронамі праводнасці; займаецца стварэннем *акустаэлектронных прылад*. Як самастойны раздзел электронікі сфарміравалася ў 1960-я г. (адкрыццё эфекту ўзмацнення гуку дрэйфуючымі электронамі праводнасці ў крышталях сульфіду кадмію). Падзяляецца на высокачастотную (мікрахвалевую) акустыку цвёрдага цела (узбуджэнне, распаўсюджванне і прыём ультра- і гіпергукавых хваляў), уласна А. (узаемадзеянне акустычных хваляў з электронамі праводнасці ў цвёрдых целах) і акустаоптыку. Займаецца распрацоўкай прылад для пераўтварэння і аналагавай апрацоўкі радыёсігналаў у дыяпазоне частот ад 1 МГц да 20 ГГц (ніжняя мяжа вызначаецца толькі памерамі існуючых крышталёў, верхняя — тэхнал. магчымасцямі вырабу субмікронных элементаў і вязкасным паглынаннем гуку ў цвёрдых целах). У А. выкарыстоўваюцца *паверхневыя акустычныя хвалі*, аб'ёмныя, прыпаверхневыя, хвалі Лэмба і інш. Асн. матэрыялы А.: *п'езаэлектрыкі* і слаістыя структуры з п'езаэлектрыкаў і паўправаднікоў, *сегнетаэлектрыкі*, *паўправаднікі* без п'езаэл. уласцівасцяў і інш. На Беларусі даследаванні па А. праводзяцца з 1970-х г. у Бел. дзярж. ун-це інфарматыкі і радыёэлектронікі і інш.

*Літ.:* Викторов И.А. Физические основы применения ультразвуковых волн Рэлея и Лэмба в технике. М., 1966; Речицкий В.И. Акустоэлектронные радиокомпоненты: Схемы, топология, конструкции. М., 1987; Морган Д. Устройства обработки сигналов на поверхностных акустических волнах: Пер. с англ. М., 1990. *В.М.Дашанкоў.*

**АКУСТАЭЛЕКТРО́ННЫЯ ПРЫЛА́ДЫ**, прылады для пераўтварэння і аналагавай апрацоўкі інфармацыі на аснове акустаэлектроннага ўзаемадзеяння. Да іх адносяцца акустаэлектронныя ўзмацняльнікі, генератары, фільтры, рэзанатары, акустычныя лініі затрымкі, дапасаваныя фільтры, прылады для кадзіравання і дэкадзіравання сігналаў і інш. Найб. пашыраны акустаэлектронныя фільтры (п'езаэл. фільтры на аб'ёмных або паверхневых хвалях); выкарыстоўваюцца для вылучэння і інтэгравання (назапашвання) сігналаў, змены іх частотнага спектра. А.п. адрозніваюцца высокай надзейнасцю, мініяцюрнымі памерамі. Выкарыстоўваюцца ў радыёвяшчанні, тэлебачанні, радыёлакацыі, касм. сувязі і інш. Гл. таксама *Акустаэлектроніка.* *В.М.Дашанкоў.*

**АКУСТАЭЛЕКТРЫ́ЧНЫ ЭФЕ́КТ**, узнікненне пастаяннага току ці электрарухальнай сілы ў праводным асяроддзі (метал, паўправаднік) пад уздзеяннем бягучай ультрагукавой (УГ) хвалі. Адкрыты Г.Вайнрахам і Х.Дж.Уайтам (ЗША, 1957) у монакрышталях германію. Паяўленне эл. току звязана з перадачай імпульсу (і адпаведна энергіі) ад гукавой хвалі электронам праводнасці. Пад уздзеяннем УГ хвалі ў правадніку ўзнікаюць лакальныя эл. палі, якія распаўсюджваюцца разам з хваляй і захопліваюць носьбіты заряду, што прыводзіць да ўзнікнення акустаэл. току. А.э. адносіцца да нелінейных эфектаў (гл. *Нелінейная акустыка*). Выкарыстоўваецца для вымярэння магутнасці УГ сігналу, частотных характарыстык УГ пераўтваральнікаў, для даследавання эл. уласцівасцяў паўправаднікоў. *У.М.Белы.*

**АКУ́СТЫКА** (ад грэч. akustikos слыхавы), раздзел *фізікі*, які вывучае пругкія ваганні і хвалі ад самых нізкіх частот (умоўна ад 0 Гц) да самых высокіх ($10^{12}$—$10^{13}$ Гц), іх узаемадзеянне з рэчывам і выкарыстанне.

Першыя звесткі аб А. — у *Піфагора* (6 ст. да н.э.). Развіццё А. звязана з імёнамі *Арыстоцеля*, Г.*Галілея*, І.*Ньютана*, Г.*Гельмгольца*. Вынікі класічнай А. падагульніў Дж.*Рэлей*. Значны ўклад у развіццё А. зрабілі М.М.*Андрэеў*, А.А.*Харкевіч*, Л.М.*Брэхаўскіх*, Л.І.*Мандэльштам*, М.А.*Леантовіч* і інш. Новы этап развіцця А. ў 20 ст. звязаны з развіццём электра- і радыётэхнікі, электронікі.

Агульная А. на аснове лінейных дыферэнцыяльных ураўненняў вывучае заканамернасці адбіцця і пераламлення *акустычных хваляў* на паверхні, распаўсюджванне, інтэрферэнцыю і дыфракцыю іх у суцэльных асяроддзях, ваганні ў сістэмах з засяроджанымі параметрамі. А. рухомых асяроддзяў і статыстычная разглядаюць уплыў руху і нерэгулярнасцяў асяроддзя на распаўсюджванне, выпрамяненне і прыём гукавых хваляў. Фізічная А. вывучае залежнасць характарыстык хваляў ад уласцівасцей і стану асяроддзя; яе падраздзелы: малекулярная А. (паглынанне і дысперсія гуку), квантавая А. (разглядае пругкія хвалі як фаноны, пры нізкіх т-рах, ва ультра- і гіпергукавым дыяпазонах). Псіхафізіялагічная А. вывучае ўздзеянне гуку на чалавека. Асн. задача электраакустыкі (магнітаакустыкі) — распрацоўка гучнагаварыцеляў, мікрафонаў, тэлефонаў і інш. выпрамяняльнікаў і прыёмнікаў гуку. Гідраакустыка і атмасферная А. — выкарыстанне гуку для падводнай лакацыі, сувязі, зандзіравання атмасферы і інш. Задачы архітэктурнай і будаўнічай А. — паляпшэнне распаўсюджвання і ўспрымання мовы і музычных гукаў у памяшканнях, памяншэнне шуму (гл. *Акустыка архітэктурная, Акустыка музычная*). Нелінейная А., акустаоптыка і *акустаэлектроніка* вывучаюць узаемадзеянне акустычных хваляў з фіз. палямі і часціцамі. Новыя магчымасці візуалізацыі гукавых палёў дала *акустычная галаграфія*. На Беларусі даследаванні па А. праводзяцца з 1950-х г. у ін-тах фіз. і фізіка-тэхн. профілю АН. Найб. значныя вынікі атрыманы Ф.І.*Фёдаравым* у тэорыі пругкіх хваляў у крышталях.

*Літ.:* Ландау Л.Д., Лифшиц Е.М. Механика сплошных сред. М., 1953; Стретт Дж.В. (лорд Рэлей). Теория звука: Пер. с англ. Т. 1—2. 2 изд. М., 1955; Скучик Е. Основы акустики: Пер. с нем. Т. 1—2. М., 1958—59; Фёдоров Ф.И. Теория упругих волн в кристаллах. М., 1965; Красильников В.А., Крылов В.В. Введение в физическую акустику. М., 1984. *А.Р.Хаткевіч.*

**АКУ́СТЫКА АРХІТЭКТУ́РНАЯ**, раздзел *акустыкі*, які вывучае гукавыя працэсы гал. чынам у закрытых памяшканнях. Выкарыстоўвае заканамернасць хвалевай, геам., статыстычнай акустыкі і электраакустыкі, даныя псіхафізіял. і слыхавога ўспрымання, стварае аптымальныя ўмовы чутнасці гаворкі, спеваў, музыкі ў аўдыторыях, кіна- і тэатр. залах, радыё-, тэле- і кінастудыях.

Адзін з асн. крытэрыяў акустычных якасцяў памяшканняў — час рэверберацыі (працягласць затухання гуку пасля спынення дзеяння яго крыніцы). Рэшткавае гучанне ўзнікае з-за шматразовага адбіцця гуку ад паверхняў памяшкання і размешчаных у ім прадметаў. Працягласць гучання расце з павелічэннем аб'ёму памяшкання, памяншаецца — з ростам гукапаглынання агароджальнымі канструкцыямі і мэбляй.

Задача акустычнага праектавання забяспечыць аптымальнасць часу рэверберацыі і аднолькава добрую чутнасць ва ўсіх пунктах памяшкання. Дасягаецца выбарам аптымальных памераў і формы памяшкання, агароджальных канструкцый і ўнутранай аддзелкі. У вял. залах выкарыстоўваюць электраакустычныя сістэмы гукаўзмацнення.

**АКУ́СТЫКА МУЗЫ́ЧНАЯ**, раздзел тэорыі музыкі, які даследуе фізічныя заканамернасці музыкі ў аспекце яе выканання і ўспрымання. Вывучае вышыню, гучнасць, *тэмбр*, даўжыню і сінтэз муз. гукаў, муз. сістэмы і строі, *кансананс* і *дысананс*, некат. з'явы ў *гармоніі*, *інструментоўцы*, аркестроўцы і інш.

Навука пра А.м. пачала развівацца ў Стараж. Грэцыі; пазней яе развівалі Дж.Царліна, М.Мерсен, Ж.Рамо і інш. У 19 ст. распрацавана рэзанансная тэорыя слыху (Г.Гельмгольц) і тэорыя адлюстравання гукавых ваганняў (К.Штумпф). У 20 ст. з'явіліся тэарэт. даследаванні, звязаныя з зоннай прыродай слыхавога ўспрыняцця (М.Гарбузаў; гл. ў арт. *Зона*), акустыкай пеўчага голасу (Р.Юсан), электрамуз. інструментаў (Л.Тэрмен, А.Валодзін), а таксама з асаблівымі з'явамі электроннай музыкі і мікратэмперацыі. Гал. праблема сучасных прац — даследаванне ролі аб'ектыўных акустычных фактараў у фарміраванні муз. мовы кампазітараў 20 ст. (Я.Назайкінскі, Ю.Рагс, Ю.Антанавічус).

*Т.Г.Мдывані.*

**АКУСТЫ́ЧНАЯ ГАЛАГРА́ФІЯ**, інтэрферэнцыйны спосаб атрымання аб'ёмных відарысаў прадметаў з дапамогай акустычных хваляў. Спачатку рэгіструецца карціна, якая атрымліваецца ў выніку інтэрферэнцыі дзвюх гукавых хваляў — рассеянай прадметам (сігнальнай) і апорнай, потым па атрыманым запісе (акустычнай галаграме) аднаўляецца відарыс прадмета. Ва ультрагукавым дыяпазоне найб. пашыраны метад паверхневага рэльефу, у якім акустычная галаграма аднаўляецца з дапамогай кагерэнтнага святла. А.г. выкарыстоўваецца ў медыцыне (ультрагукавая дыягностыка), гідралакацыі, ультрагукавой дэфектаскапіі і інш. Гл. таксама *Галаграфія*.

*Літ.*: Акустическая голография: Пер. с англ. Л., 1975; Грегуш П. Звуковидение: Пер. с англ. М., 1982. *У.М.Белы.*

**АКУСТЫ́ЧНАЯ ДЭФЕКТАСКАПІ́Я**, універсальны метад неразбуральнага кантролю, заснаваны на выкарыстанні *акустычных хваляў*. У працэсе кантролю аналізуюцца амплітудныя, фазавыя, частотныя і інш. характарыстыкі акустычных хваляў, узбуджаных вонкавай крыніцай (актыўны метад) або матэрыялам, які канталюецца (пасіўны метад). Парушэнне суцэльнасці (расколіны, ракавіны і інш.) або аднароднасці (вял. зярністасць і інш.) матэрыялу прыводзіць да скачкападобнай або плаўнай змены яго акустычных характарыстык (скорасці і каэфіцыента затухання гуку, хвалевага супраціўлення) і ўплывае на ўмовы распаўсюджвання пругкіх хваляў. Выкарыстоўваецца для кантролю матэрыялаў і вырабаў у машына- і прыладабудаванні, зварачнай вытв-сці, буд-ве і інш. *А.Р.Баеў.*

**АКУСТЫ́ЧНЫЯ ВЫПРАМЯНЯ́ЛЬНІКІ**, прылады для ўзбуджэння *акустычных хваляў*. Найб. пашыраны электраакустычныя пераўтваральнікі, дзе эл. энергія пераўтвараецца ў энергію ваганняў цвёрдага цела (выпрамяняльнага элемента), якое выпрамяняе акустычныя хвалі (напр., п'езаэл. і магнітастрыкцыйныя пераўтваральнікі, электрамагн., электрадынамічныя і электрастатычныя выпрамяняльнікі); выкарыстоўваюцца ў дэфектаскапіі, ультрагукавой тэхналогіі, мед. дыягностыцы, кантрольна-вымяральных прыладах. Газадынамічныя і газаструменныя А.в., заснаваныя на пераўтварэнні энергіі струменя газу або вадкасці ў энергію акустычных ваганняў пры перыядычным перарыванні або ўзаемадзеянні яго з цвёрдымі перашкодамі, выкарыстоўваюцца ва ультрагукавой тэхналогіі і сігналізацыі. *А.Р.Баеў.*

**АКУСТЫ́ЧНЫЯ МАТЭРЫЯ́ЛЫ**, матэрыялы для ўзбуджэння, прыёму, перадачы і паглынання *акустычных хваляў*. У акустаэлектроніцы як гукаправоды выкарыстоўваюцца матэрыялы з малымі акустычнымі стратамі ў рабочым дыяпазоне частот: шкло, сплавы на аснове магнію, плаўлены і крышт. кварц і інш.; у акустаоптыцы як святлогукаправоды — матэрыялы, празрыстыя ў адпаведнай вобласці аптычнага спектра, з малымі акустычнымі стратамі і з высокай акустааптычнай эфектыўнасцю ў рабочым дыяпазоне частот: свінцовае, тэлуравае, халькагеніднае шкло, крышталі паратэлурыту, малібдэну свінцу, фасфід і арсенід галію і інш. Для вырабу акустычных выпрамяняльнікаў і прыёмнікаў выкарыстоўваюцца *магнітастрыкцыйныя матэрыялы* і *п'езаэлектрычныя матэрыялы*, у буд-ве — гукаізаляцыйныя і гукапаглынальныя матэрыялы, якія характарызуюцца малым каэфіцыентам адбіцця і вял. каэфіцыентам паглынання акустычных ваганняў на гукавых частотах (парапласты, мінер. вата, порыстая гума і інш.).

*Ю.М.Шчэрбак.*

Да арт. **Акустычная галаграфія**: 1 — лазер; 2 — сапраўдны відарыс аб'екта; 3 — гукавая галаграма; 4 — сігнальны пучок; 5 — аб'ект; 6 — акустычныя лінзы; 7 — гукавыя генератары; 8 — апорны пучок; 9 — непразрыстая вадкасць; 10 — паветра; 11 — кагерэнтны пучок.

**АКУСТЫ́ЧНЫЯ ХВА́ЛІ**, пругкія ўзбурэнні, якія распаўсюджваюцца ў цвёрдым, вадкім і газападобным асяроддзях. Дыяпазон частот ад самых нізкіх (умоўна ад 0 Гц) да гранічна высокіх ($10^{12}$—$10^{13}$ Гц). Вылучаюць *інфрагук* (да 16 Гц), *гук* (ад 16 да $2\cdot10^4$ Гц), *ультрагук* (ад $2\cdot10^4$ да $10^9$ Гц) і *гіпергук* (ад $10^9$ да $10^{13}$ Гц). Выкарыстоўваюцца ў *акустаэлектроніцы*, дэфектаскапіі, гідралакацыі, сейсмалогіі і інш. Гл. таксама *Пругкія хвалі*.

**АКУ́Т** (ад лац. acutus востры, высокі), 1) адзін з відаў муз. націску ў стараж.-грэч., сербскай і інш. мовах. 2) Знак гэтага націску на пісьме (’). 3) Інтанацыя сучаснай літоўскай мовы, якая мае сыходны характар.

Р.Акутагава.

**АКУТАГА́ВА** Руносукэ (1.3.1892, Токіо — 24.7.1927), японскі пісьменнік. Скончыў Такійскі ун-т (1916). Выдатны стыліст і майстар навелы. У цэнтры твораў А. — вострыя праблемы сучаснасці, загадкавасць і непрадказальнасць чалавечай свядомасці (навелы-прытчы «Расёмон», 1915, «У гушчары», 1922, і інш.), трагічныя калізіі дабра ў свеце зла (псіхал. навелы «Восень», 1920, «Холад», 1924, сац.-фантаст. алегорыя «У краіне вадзянікоў», 1927, і інш.), адзінота чалавека, яго бездапаможнасць перад часам, гісторыяй (аповесць-споведзь «Жыццё ідыёта», 1927). Скончыў жыццё самагубствам. У Японіі ўстаноўлена літ. прэмія яго імя (1935). На бел. мову асобныя навелы А. пераклаў У.Шатон.

*Тв.*: Бел. пер. — Брама Расё; Нос; Павуцінкі // Далягляды. Мн., 1990; Рус. пер. — Избр. Т. 1—2. М.; 1971; Новеллы. М., 1989.

**АКУЦЫЁНАК** Пётр Антонавіч (25.4.1922, г.п. Шуміліна Віцебскай вобл. — 15.10.1943), Герой Сав. Саюза (1943). З ліп. 1941 у знішчальным атрадзе па барацьбе з фаш. лазутчыкамі і дыверсантамі. З ліп. 1943 на фронце, удзельнік Курскай бітвы. Вызначыўся ў кастр. 1943 пры фарсіраванні Дняпра каля г.п. Лоеў Гомельскай вобл. Загінуў у баі.

**АКУ́ЧВАННЕ** раслін, агратэхнічны прыём догляду пасеваў; абгортванне рыхлай глебай асновы сцяблоў раслін. Забяспечвае добрае праграванне і аэрацыю глебы, зніжае яе залішняе ўвільгатненне, садзейнічае назапашванню пажыўных рэчываў. Выкарыстоўваюць для аховы раслін ад зімовых маразоў (спаржа, артышок), веснавых замаразкаў (бульба, памідоры, вінаград, ружа), для барацьбы са шкоднікамі і хваробамі

раслін, стымуляцыі ўтварэння дадатковых каранёў і бакавых парасткаў (напр., у бульбы), што можа павялічваць ураджайнасць да 15%. Колькасць А. і тэрмін правядзення залежаць ад біял. асаблівасцяў раслін і глебава-кліматычных умоў.

**АКУШЭ́РСТВА** (ад франц. accoucher дапамагаць пры родах), галіна клінічнай медыцыны, якая вывучае фізіял. і паталаг. працэсы ў арганізме жанчыны ў час цяжарнасці, родаў і ў пасляродавым перыядзе, распрацоўвае і ўкараняе ў практыку метады родадапамогі, прафілактыкі і лячэння ўскладненняў цяжарнасці і родаў, хвароб плода і нованароджанага. Разам з *гінекалогіяй* складае адзіную мед. дысцыпліну.

Элементы навук. А. вядомы са стараж. часоў (працы Гіпакрата, 460—370 да н.э., Авіцэны, 980—1037, і інш.). У 16 ст. адкрыта першая школа павітух пры Парыжскім шпіталі, у 17—18 ст. распрацаваны аперацыі накладання акушэрскіх шчыпцоў (англ. вучоны П.Чэмберлен), павароту плода (вучоныя франц. А.Парэ, англ. У.Смелі). Заснавальніку А. ў Расіі Н.М.Амбодзік-Максімовічу належыць першы арыгінальны дапаможнік па А. (1784—86). У канцы 19 — пач. 20 ст. рус. акушэр В.В.Строганаў распрацаваў метад лячэння *эклампсіі*, які атрымаў сусветнае прызнанне. Значны ўклад у акушэрскую навуку і практыку зрабілі А.Я.Красоўскі, У.Ф.Снегіроў, І.П.Лазарэвіч, М.М.Фенаменаў, Д.А.Абуладзе.

На Беларусі навук. А. пачало развівацца пасля арганізацыі Гродзенскай мед. акадэміі (1775—81). Станаўленню сучаснага А. садзейнічалі працы І.М.Старавойтава, М.Л.Выдрына (аперацыйнае А., ахова плода і нованароджанага), Л.С.Персіянінава (таксікозы цяжарных, гіпаксія плода і нованароджанага), Н.Ф.Лызікава, В.С.Ракуця, В.Ц.Камінскай (перынатальная ахова плода і нованароджанага), І.С.Лягёнчанкі, В.Р.Лінкевіч (гіпаксія нованароджанага, акушэрская эмбрыялогія), Г.І.Герасімовіча (кесарава сячэнне), І.У.Дуды (фізіялогія і паталогія скарачальнай дзейнасці маткі), Л.Я.Супрун (праблемы імуналогіі), Г.А.Лукашэвіча (пасляродавая інфекцыя). Навук. праца вядзецца ў Бел. ін-це ўдасканалення ўрачоў, НДІ аховы мацярынства і дзяцінства, на кафедрах акушэрства і гінекалогіі мед. ін-таў. Асн. кірункі даследаванняў: невыношванне цяжарнасці (заўчасныя роды), анамаліі родавай дзейнасці, родавы траўматызм маці і плода, пасляродавыя захворванні, перынатальная ахова плода і нованароджанага, асаблівасці генерацыйнай функцыі жанчын ва ўмовах павышанай радыяцыі ў сувязі з вынікамі аварыі на Чарнобыльскай АЭС (1986). Акушэрска-гінекалагічная дапамога парадзіхам аказваецца ў радзільных дамах, жаночых кансультацыях, аддзяленнях гар., абл., раённых і інш. бальніц.

А. в е т э р ы н а р н а е — галіна *ветэрынарыі*, якая вывучае фізіялогію і паталогію палавых працэсаў і асемяненне с.-г. жывёл, цяжарнасць, роды і пасляродавы перыяд, а таксама хваробы нованароджаных, распрацоўвае метады дыягностыкі, тэрапіі і прафілактыкі бясплоднасці ў с.-г. жывёл. Праблемы А. вет. даследуюць у Віцебскай акадэміі вет. медыцыны, бел. н.-д. ін-тах эксперым. ветэрынарыі, жывёлагадоўлі, ВНУ.

*Літ.*: Акушерство. М., 1987; Ветеринарное акушерство и гинекология. 5 изд. М., 1980.

*І.У.Дуда.*

**АКЦЁР** (франц. acteur ад лац. actor выканаўца), а р т ы с т , выканаўца роляў у драматычных, оперных, балетных, муз. камедыі, лялечных спектаклях, у цыркавых, эстрадных паказах, у кіно, на радыё і тэлебачанні. Гл. *Акцёрскае мастацтва*.

**АКЦЁРСКАЕ МАСТА́ЦТВА**, від выканальніцкай творчасці, майстэрства ствараць мастацкія вобразы.

У т э а т р ы акцёр увасабляе характары, выкарыстоўваючы свае інтэлект, тэмперамент, эмоцыі, міміку, голас, рухі, жэсты, пластыку цела і г.д. Сцэн. вобраз ён стварае на аснове літ. вобраза драматургіі, разам з тым прапануе ўласнае бачанне і трактоўку вобраза, узбагачае і пашырае яго. А.м. падзяляецца на драм., опернае, балетнае, эстраднае, цыркавое і г.д.; дыферэнцыруецца паводле жанраў (камедыя, вадэвіль, фарс, трагедыя і інш.).

Да арт. **Акцёрскае мастацтва.** А.Ільінскі ў ролі Несцеркі («Несцерка» В.Вольскага).

Да арт. **Акцёрскае мастацтва.** М.Ульянаў у ролі маршала Г.К.Жукава (мастацкі фільм «Блакада»).

Элементы А.м. ў часы першабытнага грамадства меліся ў масавых дзействах, абрадах, рытуалах. Як від мастацтва сфарміравалася ў Стараж. Грэцыі. Тады ж зарадзілася традыцыя выканальніцкай стылістыкі асн. жанраў драматургіі: трагедыі (велічнасць, узнёслая пафаснасць, вытанчаная пластыка) і камедыі (падкрэсленая перабольшанасць ці знарочыстае паніжэнне таго, што паказваецца). Акцёры выступалі ў масках. У Стараж. Рыме традыцыі А.м. ўзбагаціліся жанрам *пантамімы*, у сярэднія вякі — мастацтвам гістрыёнаў і скамарохаў. У сярэднявеччы сфарміраваліся *літургічная драма, містэрыя, міракль*, маралітэ, узнік *фарс*. Вышэйшае дасягненне нар. т-ра масак — італьян. *камедыя дэль артэ*. У эпоху Адраджэння А.м. было скіравана на раскрыццё вял. ідэй, увасабленне індывід. і псіхалагічна складаных характараў. У перыяд класіцызму ў ім узмацніўся рацыяналістычны пачатак, вял. ўвага аддавалася дэкламацыйнасці. Рамантызм прывёў на сцэну ўзрыўны тэмперамент, бурныя страсці герояў, надзвычайную эмацыянальнасць і імпульсіўнасць. Рэаліст. А.м. вызначаецца дакладным і псіхалагічна тонкім раскрыццём характару. Яго тэарэт. асновы і метадалогію працы з акцёрам заклаў і распрацаваў К.С.Станіслаўскі (гл. *Станіслаўскага сістэма*). На пач. 20 ст. ўзніклі і з сярэдзіны 20 ст. атрымалі пашырэнне мадэрнісцкія плыні ў А.м. (умоўнасць, замест жыццёвых рэалій знакавасць і вобразная метафарычнасць). Побач з гэтым з'явіліся патрабаванні большай вастрыні і абагульненасці А.м., узмацнення яго агітацыйных функцый (творчасць У.Меерхольда, Б.Брэхта). Своеасаблівыя сістэмы А.м. склаліся ў т-ры Усходу (Індыя, Кітай, Японія).

Карані А.м. Беларусі ў глыбокай старажытнасці. Яго элементы меліся ў рытуальных святах, звязаных з гадавым цыклам кругавароту сонца і земляробчым календаром, з жыццём чалавека — ад з'яўлення яго на свет да памінання памерлага, у нар. ігрышчах, абрадах, карагодах. Першыя прафес. акцёры — *скамарохі*. Вял. пашырэнне на Беларусі атрымалі *школьны тэатр, батлейка, народная драма*. Характэрная выканальніцкая манера ва ўсіх відах фалькл. т-ра — завостраная сац. акрэсленасць сцэн. вобразаў, акцэнтаванне ўвагі на камед. і сатыр. рысах персанажаў, карнавальны характар ігры, узбуйненне акцёрскіх фарбаў. У 18—19 ст. прыкметны след у А.м. балета, оперы, драмы пакінулі выканаўцы гар. і маёнткавых т-раў, выхадцы з нар. нізоў, пераважна з сялян.

Развіццё бел. прафес. А.м. новага часу звязана з дзейнасцю *Дуніна-Марцінкевіча тэатра, Першай беларускай трупы Ігната Буйніцкага, Першага таварыства беларускай драмы і камедыі*. У 1920-я г. расло прафес. майстэрства, пашыраліся стылявыя пошукі. А.м. БДТ-3 характарызавалася каларытнай самабытнасцю, нар. сакавітасцю, яркасцю; у БДТ-1 ад фальклорна-этнагр. кірунку з акрэсленымі сац. матывамі А.м. ўзнялося да вы-

сокага рамант. гучання і псіхалагічна тонкага малюнка вобразаў; БДТ-2 быў адметны эксперыментатарствам, тэатр. кідкасцю. Глыбока раскрыліся таленты Ф.Ждановіча, У.Галубка, У.Крыловіча, Г.Грыгоніса, К.Міронавай і інш. У канцы 1920-х — 30-я г. на А.м. адмоўна паўплывалі ідэалагізацыя, вульгарны сацыялагізм, схематызм. Нягледзячы на гэта, А.м. развівалася, паглыбілася псіхал. распрацоўка характараў. Яркія сцэн. вобразы ўвасобілі У.Уладамірскі, Г.Глебаў, А.Ільінскі, Л.Ржэцкая. Акцёры Б.Платонаў, І.Ждановіч, пераадолеўшы вонкавую манументальнасць і рыторыку, паказвалі цікавыя ўзоры сцэн. творчасці. А.м. ўзбагацілі У.Дзядзюшка, Ц.Сяргейчык, В.Галіна, В.Пола, І.Шаціла, М.Бялінская, М.Звездачотаў, Р.Кашэльнікава, Я.Глебаўская, А.Радзялоўская, С.Бірыла, А.Шэлег.

З сярэдзіны 1960-х г. разам з акцёрамі старэйшага і сярэдняга пакаленняў (С.Станюта, Л.Рахленка, З.Стома, Г.Макарава, Ф.Шмакаў, І.Матусевіч, З.Канапелька, З.Браварская) набірала творчую сілу новае пакаленне (В.Тарасаў, Г.Гарбук, Л.Давідовіч, М.Захарэвіч, П.Дубашынскі, А.Мілаванаў, Г.Талкачова, У.Куляшоў, Г.Дубаў, Т.Кокштыс, Я.Шыпіла і інш.). Значны ўклад у А.м. зрабілі майстры рус. т-раў Беларусі (У.Кумельскі, А.Кістаў, Дз.Арлоў, А.Клімава, Р.Янкоўскі і інш.).

У 1920—40-я г. падрыхтоўка бел. акцёраў вялася ў тэатр. студыях, у 1940—60-я г. ў студыях пры т-рах імя Я.Купалы і Я.Коласа, з 1945 у Бел. тэатр. ін-це (цяпер Бел. акадэмія мастацтваў). Акцёрамі працуюць і выпускнікі Бел. ун-та культуры.

У кіно А.м. абапіраецца на традыцыі т-ра і дакумент. кінематографа. На пач. 20 ст. першых прафес. кінаакцёраў (М.Пікфард, Л. і Д.Гіш і інш.) выхаваў амер. рэжысёр Д.Грыфіт, які распрацаваў асн. прынцыпы А.м. ў кінематографе. У 1920-я г. Л.Куляшоў заснаваў школу «кінанатуршчыкаў», што імкнуліся спалучаць экспрэсіўнасць мімікі і пантамімы з натуральнасцю аблічча. С.Эйзенштэйн выкарыстоўваў «тыпаж» (непрафес. выканаўца з выразнай знешняй сац. характарнасцю). Жанравае кіно як мастацка-рэкламны сродак выкарыстоўвала «зорку» — акцёра са сталым абліччам і характарам (камед. маскі, вамп, гангстэр, «папялушка» і інш.). Выдатныя акцёры-«зоркі» стварылі глыбокія тыповыя вобразы (Ч.Чаплін, Д.Фербенкс, Пікфард, Л.Гіш, І.Мазжухін, А.Нільсен). У 1930—40-я г. са з'яўленнем гуку акцёры атрымалі магчымасць надаваць персанажам большую псіхал. і маст. аб'ёмнасць (Ж.Габэн, М.Сімон, М.Дзітрых, В.Лі, Л.Аліўе, Ч.Лоўтан, Г.Гарба, Х.Богарт, Г.Фонда, Б.Бабачкін, В.Марэцкая, Л.Арлова). У 1940—50-я г. дасягненні Куляшова і Эйзенштэйна развілі майстры італьян. неарэалізму, у 1950—60-я г. актуальнымі застаюцца імкненні да натуральнасці і псіхал. дакладнасці характараў у фільмах майстроў неарэалізму, французскай «новай хвалі», польск., венг., рас., груз. кіно, творчасці Ж.Філіпа, Ж.Маро, Дж.Мазіны, М.Мастраяні, С.Ларэн, І.Тулін, М. фон Сюдаў, Б.Ланкастэра, С.Трэсі, М.Бранда, З.Цыбульскага, Л.Вініцкай, С.Бандарчука, І.Смактуноўскага, Д.Баніёніса. М.Ульянава.

У 1970—80-я г. ў А.м. фарміраваліся разнастайныя індывід. стылі (Ж.Дэпардзьё, Дж.Нікалсан, Д.Хофман, Дж.Фонда, Л.Ульман, Х.Шыгула).

У бел. кіно ў 1920—30-я г. вызначыліся пераважна рас. акцёры. Але прыкметныя ролі стварылі і бел. акцёры У.Крыловіч, В.Пола, Б.Платонаў, Л.Мазалеўская. У 1940—50-я г. ў фільмах-спектаклях раскрылася бліскучае майстэрства Г.Глебава, Платонава, Дзядзюшкі, Рахленкі, Полы, Ржэцкай. У 1960—90-я г. высокага прафес. ўзроўню дасягнула А.м. Станюты, Стомы, Кармуніна, Г.Макаравай, Куляшова, Мілаванава, А.Дзянісава, В.Белахвосціка, Т.Мархель, У.Гасцюхіна, Г.Гарбука, М.Яроменкі, С.Сухавей.

*Літ.*: Станиславский К.С. Работа актёра над собой: Дневник ученика. Ч. 1—2. М., 1951; Советское актёрское искусство, 50—70 годы. М., 1982; Майстры беларускай сцэны. Мн., 1986; Атрошчанка А. Флярыян Ждановіч: Біягр. нарыс. Мн., 1972; Яго ж. Уладзіслаў Галубок. Мн., 1969; Есакоў А. Уладзімір Крыловіч: Жыццёвы і творчы шлях. Мн., 1956; Няфёд У. Народны артыст СССР П.С.Малчанаў. Мн., 1958; Яго ж. Народны артыст БССР У.І.Уладамірскі. Мн., 1954; Сабалеўскі А. Барыс Платонаў: Жыццё і творчасць вялікага беларускага артыста. 2 выд. Мн., 1989; Яго ж. Глеб Глебаў: Жыццё і творчасць вялікага беларускага камед. акцёра. Мн., 1994; Скібнеўскі А. Народны артыст СССР А.К.Ільінскі. Мн., 1954; Сяргейчык Ц. Нататкі акцёра: Шлях жыцця і творчасці. Мн., 1973; Кузняцова К. Ірына Ждановіч. Мн., 1970; Яе ж. Генрых Грыгоніс: Крытыка-біягр. нарыс. Мн., 1984; Гаробчанка Т. Вольга Галіна: Крытыка-біягр. нарыс. Мн., 1980; Бурьян Б. Судьба чужая — как своя: Этюды о сценич. созданиях Александры Климовой. Мн., 1982; Малчанаў П. Тэатр — жыццё маё: Успаміны. Мн., 1984; Арлова Т. Купалаўцы: Эцюды пра акцёраў. Мн., 1985; Обухович А. Полвека на сцене. Мн., 1987.

*А.В.Сабалеўскі* (тэатр), *Г.В.Ратнікаў* (кіно).

Да арт. **Акцёрскае мастацтва.** С.Станюта ў ролі Марылі («Раскіданае гняздо» Я.Купалы).

Да арт. **Акцёрскае мастацтва.** Ч.Чаплін у фільме «Агні вялікага горада».

Да арт. **Акцёрскае мастацтва.** Г.Глебаў у ролі Пустарэвіча (злева), Б.Платонаў — Адольфа Быкоўскага («Паўлінка» Я.Купалы).

**АКЦЫ́З** (франц. accise ад лац. accidere абразаць), від ускоснага падатку на тавары і паслугі ўнутр. вытв-сці. Аб'ектам такога абкладання, як правіла, з'яўляюцца тавары масавага ці абмежаванага выкарыстання, прадметы раскошы, а таксама пашыраныя камунальныя, трансп., культ. і інш. паслугі. Некаторыя краіны ў пратэкцыянісцкіх мэтах абкладаюць А. і імпартныя тавары (звыш мытных пошлін). А. уключаецца ў цану тавара і ў тарыф за паслугі і фактычна перакладваецца на спажыўца. З'яўляецца важнай крыніцай даходаў дзярж. бюджэту. У 1904 у Расіі А. (разам з вінай манаполіяй) даваў амаль 50% бюджэтных даходаў. У б. СССР у 1930—31 быў адменены. У Рэспубліцы Беларусь уведзены законам «Аб акцызах» ад 19.12.1991, які вызначае тавары і паслугі, што абкладаюцца А. Плацельшчыкамі А. з'яўляюцца юрыд. і фіз. асобы, якія ажыццяўляюць вытв. і камерцыйную дзейнасць, аказваюць паслугі.

**А́КЦЫЯ** (ад франц. action акцыя, дзеянне), 1) каштоўная папера, якая сведчыць пра ўдзел яе ўладальніка ў *акцыянерным таварыстве*, дае права атрымліваць долю прыбытку ў выглядзе *дывідэнда*, удзельнічаць у кіраванні дзейнасцю таварыства і размеркаванні маёмасці пры яго ліквідацыі. Як прадмет куплі-продажу А., апрача намінальнай вартасці, мае цану, або курс, які вагаецца ў адпаведнасці з кан'юнктурай рынку.

А. бываюць прывілеяваныя (прыносяць уладальніку раней устаноўлены працэнт даходу незалежна ад прыбытку акц. т-ва) і звычайныя (даход залежыць ад прыбытку акц.

т-ва), імянныя і на прад'яўніка. Адрозніваюць А., якія маюць адзін голас; якія не маюць голасу (у т.л. часам і прывілеяваныя); т.зв. ўстаноўчыя, якія маюць некалькі галасоў кожная і даюць права атрымліваць новыя выпушчаныя А. 2) Дзеянне з паліт., эканам., ваен. або інш. мэтай. *Г.І.Краўцова.*

**А́КЦЫЯ КАТАЛІ́ЦКАЯ**, сукупнасць свецкіх арг-цый вернікаў-католікаў, дзейнасць якіх каардынуе Ватыкан. Пачалі ствацца ў 19 ст. дзеля захавання ўплыву каталіцкай царквы і магчымасці непасрэднай паліт. дзейнасці духавенства. Арганізацыйна аформілася пасля 1922 па ініцыятыве папы Пія XI, які вызначыў яе паліт. мэты: спрыяць укараненню ў грамадстве асн. ідэй каталіцкай сац. праграмы, папскіх энцыклік (пасланняў), пашыраць грамадскую базу каталіцкай царквы, актыўна ўплываць на паліт. асяроддзе. У час парламенцкіх выбараў арг-цыі А.к. вядуць агітацыю пераважна за прадстаўнікоў каталіцкіх партый. Некаторыя з гэтых партый (ХДП у Італіі, ХДС/ХСС у Германіі, СХП у Бельгіі, АНП у Аўстрыі і інш.) прыходзілі да дзярж. улады. У залежнасці ад рэгіёна і гіст. умоў дзейнасць А.к. набывае спецыфічныя рысы: у 1929—43 у Італіі ў адпаведнасці з Латэранскімі пагадненнямі яна падпарадкоўвалася рэжыму Мусаліні; у Германіі дзейнічае пры епархіях як сістэма камісій па наглядзе за выхаваннем у школе, а праз сродкі масавай інфармацыі — за «маральным станам нацыі». У 1925—39 А.к. (пераважна суполкі пры касцёлах) дзейнічала ў Зах. Беларусі. Старшыні і сакратары гэтых суполак падпарадкоўваліся Віленскаму епархіяльнаму «Інстытуту акцыі каталіцкай», які ў сваю чаргу нёс адказнасць перад Ватыканам. Члены А.к. спалучалі прапаганду каталіцкіх ідэй з культ.-асв. работай. Пасля далучэння Зах. Беларусі да БССР (1939) арг-цыі А.к. забаронены як антысав., а іх арганізатары і кіраўнікі ў 1949—52 рэпрэсіраваны.

*Літ.:* Ковальский Н.А. Международные католические организации. М., 1962.

*А.А.Цітавец.*

**АКЦЫЯНЕ́РНАЕ ТАВАРЫ́СТВА**, форма арганізацыі вытв-сці на аснове цэнтралізацыі капіталу шляхам продажу *акцый*. Дае магчымасць аб'яднаць дробныя капіталы акцыянераў для вырашэння маштабных вытв.-гасп. праблем (буд-ва чыгунак, буйных прадпрыемстваў і інш.), аператыўна манеўраваць сродкамі, дэмакратызаваць капітал, зацікавіць акцыянераў у павелічэнні прыбытку. Бываюць адкрытыя А.т. (акцыі свабодна прадаюцца і купляюцца) і закрытыя (акцыі размяркоўваюцца толькі сярод заснавальнікаў). А.т. — юрыд. асоба, мае свой статут. Вышэйшы орган — агульны сход акцыянераў, бягучымі справамі кіруе праўленне (савет дырэктароў). Маёмасць фарміруецца за кошт укладаў акцыянераў (уласны капітал), назапашанага прыбытку, а таксама за кошт крэдытаў банка (пазыковыя сродкі) і выпуску аблігацый. Па абавязацельствах А.т. адказвае толькі сваёй маёмасцю (абмежаваная адказнасць), акцыянеры — толькі коштам іх акцый. Удзел акцыянераў у кіраванні А.т. абмежаваны. Вырашальная роля ў прыняцці рашэнняў належыць уладальніку кантрольнага пакета (51%) акцый. Але ва ўмовах распылення акцый сярод. вял. колькасці акцыянераў для атрымання большасці галасоў фактычна дастаткова 15—20% акцый.

Першыя А.т. ўзніклі ў 1600 у Англіі і ў 1602 у Нідэрландах, дзякуючы сваім перавагам сталі асн. формай прадпрымальніцкай дзейнасці сярэдніх і буйных прадпрыемстваў. У Расіі да рэформы 1861 было 120 А.т., да 1914 — 2235 (дамінуючае становішча займалі ў фабр.-заводскай прам-сці).

На Беларусі ў 1913 было 20 А.т., у 1914 ім належалі 34 буйныя прадпрыемствы: ільнопрадзільныя ф-кі ў Віцебску («Дзвіна») і ў Высачанах (Аршанскі р-н), віцебскі трамвай, з-д сухой перагонкі драўніны ў Выдрыцы (Аршанскі р-н), запалкавая ф-ка «Прагрэс-Вулкан» у Пінску, Гродзенская тытунёвая, Дубровенская тэкстыльная ф-кі і інш. Доля А.т. у аб'ёме валавой прадукцыі ў 1914 складала 14,8%. У перыяд новай эканам. палітыкі ў БССР ствараліся дзярж. (пры ўдзеле некалькіх гасп. наркаматаў), мяшаныя (дзярж.-каап. і дзярж.-прыватныя), каап. і прыватныя А.т. У розных галінах дзейнічалі Белкамунбанк, Бел. т-ва с.-г. крэдыту, Дзяржгандальбел, Віцебскгандаль, Палесгандаль, Хлебапрадукт. У 1923—28 зарэгістравана 20 прыватных А.т. У канцы 1920-х г. яны рэарганізаваны ў буйныя дзярж. прадпрыемствы. Зноў пачалі ўзнікаць з пач. 1990-х г. з фарміраваннем рыначнай эканомікі, пераважна на базе дзярж. прадпрыемстваў з удзелам сродкаў працоўных калектываў. Як А.т. ўзнікаюць і камерцыйныя банкі, біржы і інш. рыначныя структуры. На 1.10.1994 на Беларусі зарэгістравана 1021 А.т., у т.л. 780 закрытых. *Л.А.Лобан.*

**АКЦЫЯНЕ́РНАЯ КАМАНДЫ́ТА**, від кампаніі (таварыства), які спалучае элементы *акцыянернага таварыства* і камандытнага таварыства. Частка яго ўдзельнікаў (поўных кампаньёнаў), якія займаюцца прадпрымальніцкай дзейнасцю ад імя А.к., адказваюць па яе абавязацельствах усёй сваёй маёмасцю, а частка (камандытныя акцыянеры) маюць абмежаваную адказнасць — у памеры кошту сваіх *акцый*. Пашыраны ў малой і сярэдняй вытв-сці, гандлі, сферы паслуг. З'яўляецца пераходнай формай ад акц. т-ва.

Ствараюцца, як правіла, для атрымання вял. грашовых сродкаў ад рэалізацыі акцый. Засн. на калектыўнай форме ўласнасці. Маёмасць фарміруецца за кошт укладаў яго членаў. Спалучэнне прынцыпаў акц. і камандытных т-ваў у гасп. дзейнасці дае шэраг пераваг; высокая ступень адказнасці па абавязацельствах робіць А.к. надзейным партнёрам; канцэнтрацыя кіравання сярод абмежаванага кола асоб (поўных кампаньёнаў) забяспечвае дастатковую самастойнасць, свабоду і аператыўнасць у прыняцці рашэнняў; залучэнне капіталаў і інш. інвестараў спрыяе развіццю вытв-сці і павышэнню яе канкурэнтаздольнасці. *Л.А.Лобан.*

**АКЦЭЛЕРА́ЦЫЯ**, тое, што *акселерацыя*.

**АКЦЭ́НТ** (ад лац. accentus націск), 1) тое, што *націск*. 2) Знак націску над літарай («вада́»). 3) Асаблівасці вымаўлення, уласцівыя асобе, якая гаворыць не на роднай мове. 4) Вылучэнне, падкрэсліванне таго, што з'яўляецца найб. важным, галоўным у артыкуле, маст. творы і г.д. 5) У м у з ы ц ы — вылучэнне, падкрэсліванне гуку або акорда. Адрозніваюць А. дынамічны (узмацненне гучання), метрычны (вылучэнне апорных доляў такта), рытмічны (перанясенне націску з апорных доляў на слабыя — *сінкопа*, рытмічнае падаўжэнне гуку), агагічны (затрымка або зацягванне гуку), меладычны (вылучэнне гуку меладычным скачком або арнаментальнай фігурай). Сродкам акцэнтавання служыць і раптоўная змена гармоніі, тэмбру і інш.

**АКЦЭНТАЛО́ГІЯ** (ад *акцэнт* + *...логія*), раздзел *мовазнаўства*, які вывучае тыпы, асаблівасці і функцыі *націску*; сістэма моўных з'яў, звязаных з націскам. Вывучае націск у сінхранічным і дыяхранічным аспектах (гіст. і параўнальна-гіст. А.) і з уласна фаналагічных і марфалагічных пазіцый (апісальная А.).

Мае даўнюю традыцыю. У інд. брахманах (8—6 ст. да н.э.) і упанішадах (7—3 ст. да н.э.) сустракаецца паняцце «свара» — націск або тон. Пытанні А. вывучаліся ў Стараж. Грэцыі (6—4 ст. да н.э.) і Кітаі (з 5 ст. н.э.). У 19 ст. націск як самастойны аб'ект вывучэння вылучыў А.Х.Вастокаў; уклад у развіццё А. зрабілі А.А.Патабня, І.А.Бадуэн дэ Куртэнэ, Ф. дэ Сасюр, П.Ф.Фартунатаў, А.Мее.

Бел. А. сфарміравалася ў 20 ст. Упершыню націск даследаваўся ў працах Я.Ф.Карскага. Акцэнтныя сродкі бел. мовы вывучаны ў апісальным плане [М.В.Бірыла, Л.Ц.Выгонная, Л.М.Вардамацкі, М.П.Лобан, Я.І.Івашуціч, Я.Э.Смулкова (Польшча), Э.Станкевіч (ЗША)]. *Л.П.Кунцэвіч.*

**АКЦЭ́ПТ** (ад лац. accertus прыняты), 1) згода на заключэнне дагавору ў адпаведнасці з прапановай (афертай) інш. боку. 2) У міжнар. праве — аднабаковая заява пра звязанасць умовамі дагавору. 3) Прыняцце плацельшчыкам (трасатам) па пераводным вэксалі (траце) абавязацельстваў аплаціць вэксаль у вызначаны ў ім тэрмін. Такі А. афармляецца на правым баку вэксаля ў выглядзе адпаведнага надпісу акцэптанта. 4) Згода банка гарантаваць выплату сумы, названай у пераводным вэксалі. 5) Згода плацельшчыка на аплату грашовых і таварных дакументаў. Выкарыстоўваецца пры разліках за тавары, паслугі і выкананыя работы: плацеж

ажыццяўляецца са згоды плацельшчыка па разліковых дакументах, выпісаных пастаўшчыком. *Г.І.Краўцова.*

**АКЦЭ́ПТАР**, дэфект крышталічнай рашоткі *паўправадніка*, здольны «захапіць» электроны і тым забяспечыць *дзірачную электраправоднасць*. Тыповыя А. для германію (Ge) і крэмнію (Si) — атамы-дамешкі хім. элементаў III групы (B, Al, Ga, In). Гл. таксама *Донары*.

**АКЦЭСО́РНЫЯ МІНЕРА́ЛЫ** (ад лац. accessorius дадатковы), мінералы, якія ёсць у горных пародах у нязначных колькасцях (менш за 1%); заканамерная частка вывергнутых і асадкавых парод. Спачатку лічыліся выпадковымі дадатковымі мінераламі (адсюль назва). Тыповыя А.м. гранітаў — *апатыт, цыркон, турмалін, гранат* і інш. Пры разбурэнні парод намнажаюцца ў россыпах. Па характары А.м. можна выявіць роднаснасць, паходжанне і ўзрост горных парод.

**АКЦЮ́БІНСК**, горад у Казахстане, цэнтр Акцюбінскай вобл., на р. Ілёк. Засн. ў 1869 на месцы крэпасці Акцюбэ (у пер. на бел. мову — «белы ўзгорак»). 248 тыс. ж. (1987). Чыг. станцыя. Чорная металургія, машынабудаванне (рэнтгенаапаратура, с.-г. машынабудаванне і інш.), хім. (пластмасы), лёгкая і харч. прам-сць; вытв-сць буд. матэрыялаў.

**«АКЦЯ́БР»**, газета, орган ЦК КП(б)Б. Выдавалася з 7.11.1925 да 22.6.1941 штодзённа ў Мінску на яўр. мове. Асвятляла міжнар. становішча, гасп. і культ. жыццё рэспублікі, змены ў побыце яўр. насельніцтва. Раз на тыдзень змяшчала літ. старонку, на якой друкаваліся пісьменнікі І.Харык, З.Аксельрод, М.Кульбак і інш., пераклады твораў Я.Купалы, Я.Коласа, З.Бядулі, Ц.Гартнага, М.Чарота, М.Лынькова і інш.

**АКЦЯ́БР**, вёска ў Беларусі, у Буда-Кашалёўскім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Краснаакцябрскі». За 18 км на У ад г. Буда-Кашалёва, 26 км ад Гомеля, 14 км ад чыг. ст. Уза. 830 ж., 309 двароў (1994). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Каля вёскі курганны могільнік.

**АКЦЯ́БР**, вёска ў Беларусі, у Жлобінскім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Акцябр». За 9 км на Пд ад г. Жлобін, 92 км ад Гомеля. 742 ж., 288 двароў (1994). Базавая школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызанаў. Гарадзішча мілаградскай і зарубінецкай культур.

**АКЦЯ́БР**, вёска ў Беларусі, у Гарадзецкім с/с Кобрынскага р-на Брэсцкай вобл. Цэнтр калгаса «Кастрычнік». За 18 км ад Кобрына, 70 км ад Брэста, 10 км ад чыг. ст. Гарадзец. 1081 ж., 461 двор (1995). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Помнік архітэктуры — Пакроўская царква (пач. 20 ст.).

**АКЦЯ́БР**, вёска ў Беларусі, у Лагойскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Спадарожнік». За 36 км на Пн ад г.п. Лагойск, 76 км ад Мінска, 65 км ад чыг. ст. Смалявічы. 736 ж., 237 двароў (1994). Сярэдняя і пачатковая школы, Дом культуры, 2 б-кі, аддз. сувязі. Касцёл і царква. Магіла жыхароў в. Расохі, спаленых ням.-фаш. захопнікамі ў Вял. Айч. вайну.

Вядома з пач. 16 ст. як Хатаевічы, уласнасць кн. В.І.Саламярэцкага. У 18 ст. мястэчка Мінскага пав., уласнасць мясц. дамініканскага кляштара. Пасля далучэння ў 1793 да Рас. імперыі ў Барысаўскім пав. У 1908 — 466 ж., 82 двары. З 1924 цэнтр сельсавета ў Барысаўскай акр., з 1927 у Плешчаніцкім р-не. У 1939 в. Хатаевічы перайменавана ў А. З 1962 у Лагойскім р-не.

**АКЦЯ́БР**, вёска ў Беларусі, у Салігорскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Акцябр». За 24 км на З ад горада і чыг. ст. Салігорск, 140 км ад Мінска. 651 ж., 273 двары (1994). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі, гандл. цэнтр.

**АКЦЯБРО́ВА**, вёска ў Беларусі, у Кармянскім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Зара камунізму». За 17 км на ПнЗ ад Кармы, 105 км ад Гомеля, 55 км ад чыг. ст. Рагачоў. 760 ж., 321 двор (1995). Сярэдняя школа, 2 б-кі, Дом культуры.

**АКЦЯ́БРСКАЯ**, вёска ў Беларусі, у Віцебскім р-не. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Сялюты». За 10 км на ПдУ ад Віцебска, 3 км ад чыг. ст. Забалоцінка. 1650 ж. (1994), забудавана 2—5-павярховымі дамамі (40) і катэджамі (65). 4 цэхі (кулінарны райспажыўсаюза, па вырабе аўчын, малога прадпрыемства «Палідрэў», рытуальных паслуг). Віцебскае прафес.-тэхн. вучылішча, сярэдняя школа, Дом культуры, 3 б-кі, бальніца, аддз. сувязі, Дом быту, гандл. цэнтр.

**АКЦЯ́БРСКІ**, горад у Башкортастане, на р. Ік, за 25 км ад чыг. ст. Туймазы. Узнік у сувязі з адкрыццём у 1937 Туймазінскага радовішча нафты. 107,3 тыс. ж. (1992). Цэнтр нафтаздабыўной прам-сці. Машынабудаванне (нафтавае абсталяванне, аўтапрылады і інш.) і металаапрацоўка, лёгкая прам-сць. Вытворчасць буд. матэрыялаў.

**АКЦЯ́БРСКІ**, гар. пасёлак у Беларусі, цэнтр Акцябрскага р-на Гомельскай вобл., на р. Нератоўка (прыток Пцічы). За 190 км ад Гомеля, 7 км ад чыг. ст. Рабкор на лініі Бабруйск—Рабкор, на аўтадарозе Глуск—Азарычы. 8,4 тыс. ж. (1994).

Утвораны 31.8.1954 у выніку аб'яднання вёсак Карпілаўка, Рудобелка і Рудня. Сяло Рудобелка (Рудыя Белкі) вядома з сярэдзіны 15 ст. як велікакняжацкае ўладанне, здавалася ў часовае трыманне ці арэнду Радзівілам, Вішнявецкім і інш. З 1661 прыватнае ўладанне. У канцы 18 ст. належала памешчыку Д.Лапе, які заснаваў маёнтак Карпілаўка. У 1918—20 існавала *Рудабельская рэспубліка*. У студз. 1920 Рудобелка спалена польск. войскамі, пасля вызвалення воласць перайменавана ў Акцябрскую. У 1939 утворацы Акцябрскі р-н з цэнтрам у в. Карпілаўка. У 1962—66 А. ў Светлагорскім р-не.

Завод сухога абястлушчанага малака, спіртзавод, хлебазавод, камбінат быт. абслугоўвання, райаграпрамтэхніка, лясгас, лесапункт Бабруйскага леспрамгаса, метэастанцыя. Сярэдняе ПТВ механізацыі, 3 сярэднія, дзіцяча-юнацкія спарт. і муз. школы, 3 дашкольныя ўстановы, Дом піянераў і школьнікаў, Дом культуры, *Акцябрскі музей народнай славы*, 2 б-кі, кінатэатр, бальніца. Брацкія могілкі сав. воінаў і партызанаў, магілы ахвяр фашызму.

**АКЦЯ́БРСКІ**, рабочы пасёлак у Беларусі, у Чашніцкім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр пасялковага Савета і торфапрадпрыемства «1 Мая». За 12 км на У ад г. Чашнікі, 80 км ад Віцебска, 15 км ад чыг. ст. Чашнікі. Утвораны ў 1967 з пасёлка торфапрадпрыемства «1 Мая» (існаваў з 1949). 310 ж., 141 двор (1994). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, аптэка, аддз. сувязі.

**АКЦЯ́БРСКІ МУЗЕ́Й НАРО́ДНАЙ СЛА́ВЫ**. Засн. ў 1967 у г.п. Акцябрскі Гомельскай вобл. Меў 2026 адзінак асн. фонду (1993). Сярод экспанатаў макет бел. хаты, прадметы сял. побыту і традыц. працы, мужчынскія і жаночыя нац. касцюмы; дакументы з гісторыі в. Рудобелка; матэрыялы пра жыццё і дзейнасць дзекабрыста М.*Лапы*, вядомых землякоў К.П.*Арлоўскага*, А.Р.*Салаўя*, М.А.*Ляўкова*, Л.Я.*Адзінцова* і інш.; пра падзеі Вял. Айч. вайны (баявыя дзеянні на тэр. раёна партыз. атрадаў і брыгад, патрыят. падполля, асабістыя рэчы і дакументы Герояў Сав. Саюза Ц.П.Бумажкова, Ф.І.Паўлоўскага, Ф.М.Языковіча і інш., вызваленне раёна ад ням. фашыстаў). Экспанаты музея расказвалі таксама пра ўраджэнцаў раёна, якія ваявалі ў Афганістане. 5.2.1994 у выніку пажару большасць экспанатаў загінула.

**АКЦЯ́БРСКІ РАЁН**, у Беларусі, на ПнЗ Гомельскай вобл. Утвораны 28.6.1939. Пл. 1,4 тыс. км$^2$. Нас. 21,3 тыс. чал. (1995); сярэдняя шчыльнасць 15 чал./км$^2$; гарадскога 15,3%. Цэнтр —

г.п. *Акцябрскі*, 77 сельскіх нас. пунктаў. Падзяляецца на 8 сельсаветаў: Акцябрскі, Валосавіцкі, Ламавіцкі, Любанскі, Ляскавіцкі, Пярэцкі, Пратасаўскі, Чырвонаслабодскі.

Знаходзіцца ў паўн.-ўсх. ч. Прыпяцкага Палесся. Паверхня — плоская раўніна, месцамі дзюнныя ўзгоркі. Пераважаюць выш. 130—140 м над узр. м., найвыш. пункт 176,4 м. Карысныя выкапні: нафта (Азямлінскае і ч. Вішанскага радовішча), торф (больш за 50 радовішчаў), гліна, жвір, пясок. Сярэдняя т-ра студз. -6,3 °С, ліп. 18,4 °С. Ападкаў 627 мм за год. Вегетацыйны перыяд 195 дзён. Рэкі: Пціч з прытокамі Арэса і Нератоўка, Трэмля з прытокам Ветка; Слаўкавіцка-Ямінскі асушальны канал (левы прыток Арэсы). Гушчыня натуральнай рачной сеткі 0,5 км/км$^2$. Глебы пераважна тарфяна-балотныя і дзярнова-падзолістыя забалочаныя. Лясы (55% тэр.) хваёвыя і хваёва-шыракалістыя, трапляюцца драбналістыя і дубова-грабавыя. Агульная пл. балот 14 тыс. га. Акцябрскі фауністычны заказнік, заказнік-журавіннік Бабінец.

У эканоміцы раёна гал. роля належыць сельскай гаспадарцы. Пад с.-г. ўгоддзямі 46,2 тыс. га (33% тэр.), з іх асушаных 29,1 тыс. га. Асн. галіна — жывёлагадоўля мяса-малочнага кірунку. Птушкагадоўля. Вырошчваюць збожжавыя і зернебабовыя, бульбу, кармавыя культуры; з тэхн. — лён-даўгунец. У раёне прадпрыемствы харч. (вытв-сць сухога абястлушчанага малака, масла, спірту), дрэваапр. (лясгас, лесапункт Бабруйскага леспрамгаса), здабыўной (нафта і торф, сапрапелі) прам-сці; раённае аб'яднанне «Сельгастэхніка». На 1.1.1995 было 8 калгасаў і 6 саўгасаў. Па тэр. раёна праходзіць чыг. ветка Жлобін—Рабкор, аўтадарогі Глуск—Азарычы, Парычы—Капаткевічы. На 1995 у раёне 15 базавых і сярэднеагульнаадук. школ, муз. школа, прафес.-тэхн. вучылішча механізацыі сельскай гаспадаркі, 16 дашкольных, 20 клубных і 25 бібліятэчных устаноў, 3 бальнічныя ўстановы, зоны адпачынку (часткова) Арэса і Пціч. Музей нар. славы. Помнік архітэктуры 19 ст. — брама, помнік сядзібна-паркавага мастацтва — парк канца 19 ст. ў в. Харомцы. Помнік «Беларусь партызанская» ў в. Слабодка. Раённая газ. «Чырвоны Кастрычнік».

*Г.М.Дзегцяроў.*

**АКЦЯБРЫ́СТЫ**, «Саюз 17 кастрычніка», праваліберальная партыя чыноўнікаў, памешчыкаў і буйной гандлёва-прамысл. буржуазіі ў Рас. імперыі ў 1905—17. Створана пасля апублікавання *Маніфеста 17 кастрычніка 1905* (октября — адсюль назва). Лідэры — А.І.Гучкоў, П.Л.Корф, М.У.Радзянка, Дз.М.Шыпаў і інш. Праграма партыі прадугледжвала спадкаемную канстытуцыйную манархію, захаванне «адзінай і непадзельнай Расіі» (з правам на аўтаномію толькі для Фінляндыі), дэмакр. свабоды, зямельную рэформу (ліквідацыя абшчыны, падтрымка заможных сялян) і інш. А. падтрымлівалі ўнутр. і знешнюю палітыку царскага ўрада, выступалі супраць рэв. руху. Друкаваныя органы газ. «Слово» (1905—06), «Голос Москвы» (1906—15) і інш. (усяго больш за 50). Агульная колькасць чл. каля 80 тыс. чал. Самая шматлікая фракцыя ў 3-й Дзярж. думе, папераменна блакіравалася з умерана-правымі і кадэтамі. У 1915 А. ўступілі ў апазіцыйны «Прагрэсіўны блок». Вясной 1917 на базе партыі А. утварылася Ліберальная рэсп. партыя на чале з Гучковым і Радзянкам.

На Беларусі аддзелы А. дзейнічалі ў Віцебску, Гродне (158 чал.), Магілёве, Мінску (100 чал.), некаторых пав. гарадах; выдаваліся газ. «Минская речь», «Минское слово», «Витебский голос».

**АКЧАГЫ́ЛЬСКАЕ МО́РА** (па ўрочышчы Акчагыл на Краснаводскім п-ве), існавала ў познім пліяцэне (каля 1,8—3,2 млн. гадоў назад) на ПдУ Еўропы на месцы Каспійскага м. і Прыкаспійскай

Рака Ала ў Бабруйскім раёне.

нізіны. У пэўныя перыяды злучалася з басейнам, які быў на месцы Азоўскага мора. Намнажаліся адклады: вапнякі, мергелі, гліны, пяскі. Час існавання вызначаюць па характэрным акчагыльскім комплексе малюскаў.

**АКЧАКА́Я**, Акджакая, бяссцёкавая ўпадзіна на ПнЗ пустыні Каракумы, самая глыбокая ў Туркменіі. Даўж. каля 50 км, шыр. каля 6 км, адносная глыб. 200 м. Дно ўпадзіны ляжыць на 81 м ніжэй за ўзровень мора.

**АК-ШЫЙРА́К**, Акшыйрак, горны масіў у Цянь-Шані, у Кыргызстане. Цягнецца з ПдЗ на ПнУ трыма кулісападобнымі паралельнымі хрыбтамі даўж. каля 50 км, выш. да 5126 м. Водападзел вярхоўяў Нарына і рэк бас. Сарыджаза (Учкёль і інш.). Складзены з метамарфічных сланцаў, вапнякоў, гранітаў. Рэльеф высакагорны. Цэнтр зледзянення ў Цянь-Шані (59 ледавікоў пл. больш за 400 км$^2$). Самы вял. ледавік Пятрова, дае пачатак р. Нарын.

**АКЫ́Н**, паэт-імправізатар і пясняр, майстар вуснапаэт. творчасці ў казахаў, кіргізаў і некат. інш. народаў. Імправізуе ў форме песеннага рэчытатыву пад акампанемент домбры. Мастацтва імправізацыі патрабуе высокай прафес. падрыхтоўкі, ведання нар. жыцця, нар. творчасці і мовы, чым вылучаліся многія непісьменныя А. Шырокае прызнанне А. звычайна набывалі пасля айтысаў — песенных спаборніцтваў.

**АК'ЯБ**, горад на З М'янмы; гл. *Сітуэ.*

**АКЯЛА́ЙЦІС** (Akelaitis; Акялевіч) Мікалоюс (6.12.1829, в. Чуадэрышкіс Капсукскага р-на, Літва — 27.9.1887), літоўскі грамадскі дзеяч, асветнік, пісьменнік. Пазнаёміўшыся ў 1850-х г. з В.Дуніным-Марцінкевічам, В.Каратынскім, У.Сыракомлем, А.Кіркорам, распрацаваў у 1859 план выдання кніг для беларусаў і літоўцаў на іх родных мовах. Выдаў літоўскі лемантар, граматыку і дыдактычную аповесць «Квестар» (усе 1860), у 1861 зрабіў літоўскую перапрацоўку бел. «Гутаркі старога дзеда», апісаў рэцэнзію на 2 часткі «Пана Тадэвуша» А.Міцкевіча, выд. у бел. перакладзе Дуніна-Марцінкевіча (апубл. ў кн. «Пачынальнікі», 1977). У час паўстання 1863—64 пам. камісара паўстанцкага Часовага ўрада ў Аўгустоўскім ваяв. Пасля задушэння паўстання эмігрыраваў у Францыю, дзе і памёр. *А.І.Мальдзіс.*

**АЛА**... (ад грэч. allos іншы), першая састаўная частка складаных слоў, якая па значэнні адпавядае словам «іншы», «розны», «зменены», напр., *алагенез, аламетрыя.*

**АЛА́**, рака ў Беларусі, у Кіраўскім, Бабруйскім р-нах Магілёўскай вобл. і Жлобінскім, Светлагорскім р-нах Гомельскай вобл., левы прыток Бярэзіны (бас. Дняпра). Даўж. 100 км. Пл. вадазбору 1230 км$^2$ у межах Цэнтральнабярэзінскай раўніны і Прыдняпроўскай нізіны. Даліна пераважна трапецападобная, шыр. 0,8—1 км. Пойма (у вярхоўі асушаная і разараная) шыр. ад 0,5 да 1,5 км. Рэчышча каналізаванае. Берагі стромкія, выш. 1—3 м, у ніжнім цячэнні нізкія. Асн. прытокі: Рылейка, Беліца, Вял. Вязанка. Сярэднегадавы расход вады ў вусці 5,9 м$^3$/с, 52% гадавога сцёку прыпадае на вясну. Выкарыстоўваецца як водапрыёмнік меліярац. сістэм. На рацэ г.п. Кіраўск.

**АЛА́-АД-ДЗІ́Н ХІЛЬДЖЫ́**, правіцель [1296—1316] *Дэлійскага султаната.* Увёў адзіную адм. сістэму, упарадкаваў збор феад. рэнты. Трымаў вял. армію, якая адбівала напады (1303—08) манголаў, заваявала (1306—13) Дэкан на Пд Індыі. А. ўпершыню з часоў *Ашокі* стварыў адзіную дзяржаву, якая ўключала амаль усю тэр. Індыі.

**АЛАБА́МА** (Alabama), рака ў Паўн. Амерыцы, на ПдУ ЗША. Даўж. 640 км. Пл. бас. 115 тыс. км$^2$. Утвараецца ад зліцця рэк Куса і Талапуса, якія сцякаюць з паўд. адгор'яў Апалачаў. Цячэ па Прымексіканскай нізіне. Пасля злучэння з р. Тамбігбі наз. Мабіл, упадае ў аднайм. заліў Мексіканскага заліва. Ра-

зводдзе вясной, сярэдні расход вады 1790 м³/с. Вадасховішчы. Суднаходная ад г. Мантгомеры. У вусці марскі порт Мабіл.

**АЛАБА́МА** (Alabama), штат на Пд ЗША. Пл. 131,4 тыс. км², нас. 4187 тыс. чал. (1993). Адм. ц. — г. Мантгомеры. Найб. гарады Бірмінгем, Мабіл, Хантсвіл. Большая ч. тэрыторыі занята нізіннай прыморскай раўнінай, месцамі забалочанай, на Пн і ПнУ — адгор'і Апалачаў. Клімат умерана цёплы, на Пд субтрапічны. Ападкаў каля 1500 мм за год. Рэкі Алабама, Тэнесі. Вядучая галіна эканомікі — апрацоўчая прам-сць. Развіты чорная металургія (Бірмінгем), вытв-сць алюмінію, пластмасаў, гумы, хімікатаў, тэкстылю, электратэхн. абсталявання. Прадпрыемствы цэлюлозна-папяровай, авіяракетнай, суднабуд., тэкст. прам-сці. Здабыча вугалю, нафты, прыроднага газу. ГЭС на р. Тэнесі. У сельскай гаспадарцы пераважае жывёлагадоўля (адкорм буйн. раг. жывёлы, авечак, свіней, бройлераў). Вырошчваюць сою, кукурузу, бавоўнік, сеяныя травы, арахіс, агародніну, садавіну. Чыг., аўтамаб., водны транспарт. Марскі порт Мабіл.

**«АЛАБА́МА»**, канфлікт паміж ЗША і Англіяй у час *Грамадзянскай вайны ў ЗША 1861—65.* Выкліканы ваен. дапамогай Англіі мяцежным рабаўладальніцкім штатам. Англ. крэйсер «Алабама» ў 1862—64 захапіў і знішчыў 68 гандл. і 1 ваен. карабель паўн. штатаў. Сам быў патоплены 14.7.1864. Пасля заканчэння вайны ЗША узнялі пытанне пра адказнасць Англіі за дзеянні «Алабамы» і інш. яе крэйсераў. Арбітражны суд у Жэневе 14.9.1872 вынес рашэнне, паводле якога Англія заплаціла ЗША 15,5 млн. долараў.

**АЛАБРО́ГІ** (лац. Allobroges), кельцкае племя, якое жыло паміж Жэнеўскім воз., рэкамі Рона і Ізер і Альпамі. Іх гал. гарады — Віена (сучасны В'ен у Францыі) і Генава (сучасная Жэнева). А. выступалі на баку *Ганібала* (218 да н.э.), у 121 да н.э. падпарадкаваны рым. палкаводцам Фабіем Максімам Квінтам, а іх тэр. ўключана ў склад правінцыі Карбонская Галія.

**АЛАБЯ́Н** Каро Сямёнавіч (26.7.1897, г. Пяндж, Таджыкістан — 5.1.1959), сав. архітэктар. Скончыў Маскоўскі вышэйшы дзярж. маст.-тэхн. ін-т (1929). Заснавальнік Усерас. т-ва пралет. архітэктараў, адказны сакратар Саюза архітэктараў СССР (1932—50), віцэ-прэзідэнт Акадэміі архітэктуры СССР (1949—53). Асн. работы: Тэатр Сав. Арміі (1934—40) і павільён Арм. ССР на ВДНГ (1939 і 1954) у Маскве; ген. план аднаўлення Валгаграда (1945, у сааўт.), павільён СССР на Сусветнай выстаўцы ў Нью-Йорку (1939, з Б.Іафанам).

**АЛАВЕ́РДЫ**, кафедральны сабор 1-й чвэрці 11 ст., помнік груз. сярэдневяковага дойлідства. Пабудаваны за 20 км на ПнЗ ад г. Тэлаві. Выцягнутае ўверх збудаванне, у плане — падоўжаны крыж; у сяродкрыжжы купал на высокім барабане (рэканструяваны ў 15 ст.). Грандыёзная ўнутр. прастора (выш. больш за 42 м). Дэкор скупы. У 1960-я г. раскрыта размалёўка 15 ст.

**АЛАВЯ́НЫ КАЛЧАДА́Н**, мінерал, тое, што *станін*.

**АЛАВЯ́НЫ КА́МЕНЬ**, мінерал, тое, што *касітэрыт*.

**АЛАВЯ́НЫЯ РУ́ДЫ**, прыродныя мінер. ўтварэнні, якія маюць волава ў злучэннях і канцэнтрацыях, дастатковых для прамысл. здабычы. Прамысл. мінералы *касітэрыт* (каля 78% Sn) і *станін* (22—28% Sn). Падзяляюць на эндагенныя (карэнныя) і экзагенныя (россыпныя). Карэнныя радовішчы сфарміраваліся ў пародах алюма-сілікатнага саставу і прадстаўлены касітэрыт-кварцавымі і касітэрыт-сульфіднымі рудамі (прамысл. колькасць Sn 0,1—0,2%). Важнае прамысл. значэнне маюць россыпы (сярэдняя колькасць каля 300—500 мг/м³, у іх каля 70% сусв. запасаў волава, даюць да 75% усёй здабычы металу). Асн. рэсурсы — у Інданезіі, Малайзіі, Тайландзе, Балівіі, Бразіліі, Нігерыі, Аўстраліі.




**АЛАГА́МІЯ**, гл. *Перакрыжаванае апыленне.*

**АЛАГЕНЕ́З** (ад *ала...* + *...генез*), кірунак эвалюцыі групы арганізмаў, пры якой у блізкіх відаў адбываецца змена адных прыватных прыстасаванняў на іншыя, а агульны ўзровень арганізацыі застаецца ранейшым. Выяўляецца гэта ў адаптыўных ператварэннях (напр., пры змене асяроддзя наземнага на воднае) — аламарфозах, або *ідыяадаптацыях*.

Адзначаецца на ўсіх стадыях індывід. развіцця жывёлы — ад зародка, лічынкі і маляўкі да дарослай асобіны. Пры гэтым адны органы прагрэсіўна развіваюцца, іншыя — трацяць функцыян. значэнне і рэдукуюцца. Прыкладам прыстасавання арганізмаў да спецыфічных умоў эмбрыянальнага або лічынкавага развіцця (*цэнагенез*) з'яўляюцца якасныя новаўтварэнні: амніён, харыён, плацэнта і інш.

**АЛАГЁЗ**, самая высокая вяршыня Арменскага нагор'я; гл. *Арагац*.

**АЛАГІ́ЗМ** (ад *а...* + грэч. logismos розум), 1) у л о г і ц ы адмаўленне ці рэзкае перамяшчэнне ролі лагічнага мыслення як сродку дасягнення ісціны; логіцы проціластаўляецца *інтуіцыя*, вера і інш. Выкарыстоўваецца для

Сабор Алаверды.

апраўдання *ірацыяналізму, містыцызму*, фідэізму. Часта бывае схаваны фармальнай правільнасцю выказвання, але абвяргаецца грамадскай практыкай чалавецтва і гісторыяй навукі. 2) У с т ы л і с т ы ц ы наўмыснае парушэнне ў мове лагічных сувязей з мэтай стылістычнага (у т.л. камічнага) эфекту.

**АЛАГО́АС** (Alagoas), штат на ПнУ Бразіліі, на Пн ад ніжняга цячэння р. Сан-Францісіку. Пл. 27,7 тыс. км². Нас. 2409 тыс. чал. (1989). Адм. ц. — г. Масеё. Плантацыйнае вырошчванне цукр. трысняту і бавоўны. Харч. і тэкст. прам-сць. На р. Сан-Францісіку каля вадаспадаў Паўлу-Афонсу ГЭС.

**АЛА́ДАВА** Алена Васілеўна (22.5.1907, г. Пружаны — 29.5.1986), бел. мастацтвазнавец. Засл. дз. маст. Беларусі (1966). Жонка М.І.*Аладава*. Скончыла БДУ (1928). З 1937 працавала ў музеях Мінска. У 1944—77 дырэктар Дзярж. маст. музея Беларусі. Яе намаганнямі ў пасляваен. гады адноўлены фонд музея, сабраны творы бел., рус., зарубежнага мастацтва (у 1977 больш за 15 тыс. экспанатаў), арганізаваны шматлікія экспазіцыі і выстаўкі. Аўтар кніг пра твор-

часць І.Ахрэмчыка, П.Гаўрыленкі, В.Цвіркі, пра Дзярж. маст. музей Беларусі (1958), бел. жывапіс (1978) і інш.

**АЛА́ДАВА** Радаслава Мікалаеўна (н. 11.2.1945, Мінск), бел. музыказнавец. Канд. мастацтвазнаўства (1980). Дачка М.І.*Аладава*. Скончыла Бел. кансерваторыю (1968). З 1971 выкладае ў Бел.

М.І.Аладаў.

акадэміі музыкі. Навук. працы пераважна па пытаннях нац. муз. стылю.

*Тв.*: Аб поліфанізацыі фактуры ў беларускай сімфанічнай музыцы другой палавіны 50-х—60-х гадоў // Бел. музыка. Мн., 1975. Вып. 1; Белорусское симфоническое творчество // Межнациональные связи в советской музыкальной культуре. Л., 1987; «Фольклорный» камерно-вокальный цикл в белорусской музыке 70-х гг. // Вопр. культуры и искусства Белоруссии. Мн., 1988. Вып. 7; Опера С.Картэса «Візіт дамы» ў яе сувязях з літаратурай // Т а м ж а . 1994. Вып. 13.

**АЛА́ДАЎ** Вальмен Мікалаевіч (н. 12.2.1930, Мінск), бел. архітэктар. Засл. архітэктар Беларусі (1969). Канд. архітэктуры (1972). Сын М.І.*Аладава*. Скончыў Маскоўскі арх. ін-т (1953). Працаваў у ін-це «Белдзяржпраект», у 1965—80 дырэктар ін-та «Белдзіпрагандаль», з 1980 выкладае ў БПА. Асн. работы: абл. бібліятэка ў г. Маладзечна; Камароўскі крыты рынак у Мінску; рэсп. спарт. комплекс «*Раўбічы*» (у сааўт.); афармленне выставак дасягненняў нар. гаспадаркі Беларусі ў Лейпцыгу, Плоўдзіве, Мінску, Маскве (усе ў аўтарскім калектыве). У 1966—70 старшыня праўлення Саюза архітэктараў Беларусі.

**АЛА́ДАЎ** Мікалай Ільіч (21.12.1890, С.-Пецярбург — 4.12.1972), бел. кампазітар і педагог. Нар. арт. Беларусі (1955). Скончыў С.-Пецярбургскую кансерваторыю экстэрнам (1910). Працаваў ва Усх. кансерваторыі (Казань), у Дзярж. ін-це муз. навукі (Масква). Уваходзіў у *Беларускую песенную камісію*. З 1924 у Мінску. Адзін з арганізатараў і выкладчыкаў Бел. муз. тэхнікума і кансерваторыі (з 1946 праф., у 1944—48 дырэктар), удзельнічаў у стварэнні бел. кампазітарскай арганізацыі (1932). Рэдактар многіх муз. выданняў (у т.л. твораў М.Чуркіна, Р.Пукста), збіральнік і даследчык бел., марыйскага, чувашскага, якуцкага фальклору, аўтар апрацовак нар. песень. Творчасць адметная праграмнасцю, сімфанічнасцю мыслення, шырокім выкарыстаннем сродкаў поліфаніі, нац. характэрнасцю музыкі. Сваімі творамі 1920—30-х г. залажыў асновы такіх жанраў бел. прафес. музыкі, як кантата («10 год», 1927), вак.-сімф. паэма («Над ракою Арэсай» на вершы Я.Купалы, 1933), камерна-інстр. ансамбль (фп. квінтэт, 1925). Своеасаблівасцю жанравага вырашэння вылучаецца опера «Тарас на Парнасе»— «муз.-драм. жарт» (па матывах бел. ананімных паэм «Тарас на Парнасе» і «Энеіда навыварат» і паэмы В.Дуніна-Марцінкевіча «Гапон», 1927). Стварыў першыя ў бел. музыцы ўзоры драм. (2-я, 1930) і лірыка-псіхалагічнай (4-я і 5-я, 1954—56) сімфоніі.

*Інш. тв.*: опера «Андрэй Касценя» (1947, паст. 1970); кантата «Сорак год» (1956); 10 сімфоній (1921—71), сімфаньета (1936), сімф. паэма «З дзённіка партызана» і сімфонія-балада «У суровыя дні» (1942), 4 сюіты-фантазіі для сімф. арк., канцэртныя фантазіі для скрыпкі і флейты з арк.; камерныя ансамблі;

Да арт. **Аладжа-Хююк**. Штандар з царскага могільніка.

санаты; зб. рамансаў на вершы А.Кальцова, Я.Купалы, М.Багдановіча, М.Танка, Н.Гілевіча і інш.; хары, песні.

*Літ.*: К у л е ш о в а Г.Г. Н.И.Аладов. Л., 1970; А л а д а в а Р.М. М.І.Аладаў // Бел. музыка. Мн., 1977. Вып. 2. *С.Г.Нісневіч.*

**АЛАДЖА́-ХЮЮ́К** (Alaca Hüyük), узгорак недалёка ад г. *Багазкёй* на Пн Цэнтр. Турцыі, дзе выяўлены археал. напластаванні ад эпох *энеаліту* і *бронзавага веку* (4—3-е тыс. да н.э.) да 7—6 ст. да н.э. Раскопкамі з 1935 выяўлены царскі (?) могільнік з 13 пахаваннямі (2-я пал. 3-га тыс. да н.э.). У грунтавых камерах разам з касцякамі нябожчыкаў знойдзена шмат залатых і медных вырабаў (посуд, зброя, фігуркі быкоў і аленяў, упрыгожанні). Да хецкага часу (2-е тыс. да н.э.) адносяцца рэшткі абарончых сцен з варотамі (упрыгожаны фігурамі сфінксаў), храма і інш. збудаванняў.

**АЛА́ДКІ**, бел. традыцыйны мучны выраб. Пшанічную муку (вышэйшых гатункаў) замешваюць на заквасцы, разведзенай малаком, сыраквашай, сывороткай. У цеста дадаюць яйкі, масла, соду або дрожджы. Пякуць на змазанай тлушчам патэльні ў гарачым духу печы. Гатовыя А. мажуць маслам, мачаюць у тук, смятану ці варэнне, даўней палівалі цёртым макам (найчасцей на Каляды). Пашыраны па ўсёй тэр. Беларусі. На Палессі А. наз. бліны з таркаванай бульбы.

**АЛАЗА́НЬ-АЎТАРА́НСКАЯ РАЎНІ́НА**, А л а з а н ь - А г р ы ч а й с к а я д а л і н а , у Грузіі і Азербайджане, уздоўж паўд. падножжа В. Каўказа, па далінах рэк Алазань і Агрычай. Цягнецца на 200—225 км, шыр. ад 20 да 40 км, выш. да 450 м. Характэрны пераважна ўзараныя стэпы, дубовыя і альховыя лясы, сады. Грузінская ч. А.-А.р. наз. *Кахецінскай раўнінай*. Раён вінаградарства.

**АЛАЗЕ́ЙСКАЕ ПЛАСКАГО́Р'Е**, на ПнУ Сібіры, у Рэспубліцы Саха (Якуція), у міжрэччы рэк Індыгірка, Калыма, Алазея і Ажогіна. Даўж. 300 км. Выш. да 954 м. Складзена пераважна з гнейсаў, перакрытых вулканагенна-асадкавымі і туфагеннымі адкладамі, перарванымі гранітамі. Характэрны ізаляваныя масівы і хрыбты з плоскімі вяршынямі. На схілах да выш. 450 м забалочаныя лістоўнічныя рэдкалессі, да 600 м зараснікі кедравага сланцу, вышэй — горная тундра.

**АЛАЗЕ́Я**, рака на ПнУ Рэспублікі Саха (Якуція). Даўж. 1590 км, пл. бас. 64,7 тыс. км$^2$. Утвараецца ў сутоках рэк Нелькан і Кадылчан на Алазейскім пласкагор'і. Цячэ па Калымскай нізіне, упадае 2 пратокамі ва Усх.-Сібірскае мора. Найбольшы прыток Расоха (злева). Ледастаў з канца вер. — пач. кастр. да канца мая — пач. чэрвеня. Сяроднегадавы расход у ніжнім цячэнні 300 м$^3$/с. У бас. А. больш за 24 тыс. азёраў.

**АЛА́ІД**, дзеючы вулкан на в-ве Атласава, у Ахоцкім м., найвыш. ў В. Курыльскай градзе. Выш. да 2339 м. Падводная ч. ўтворана асновай уласна А., размешчанай на больш стараж. вулканічным конусе. Складзены з андэзітабазальтавых лаваў. Каля асновы амаль 30 пабочных конусаў. Схілы ўкрыты альхова-рабінавымі зараснікамі, высакатраўем. З выш. 700—800 м — палосы лёду і снегу. За 200 апошніх гадоў каля 6 вывяржэнняў.

**АЛА́ІЗБЕРГ**, возера ў Беларусі, у Глыбоцкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Свіліца, за 16 км на У ад г. Глыбокае. Пл. 0,46 км$^2$. Даўж. 4,1 км, найб. глыб. 19 м. Пл. вадазбору 17 км$^2$. Схілы катлавіны выш. 5—7 м, на У укрыты лесам. Дно плоскае, пясчанае. Выцякае ручай у р. Свіліца.

**АЛА́ЙСКІ ХРЫБЕ́Т**, у сістэме *Гісара-Алая*, у Кыргызстане і часткова ў Таджыкістане. Падзяляе Ферганскую і Алайскую даліны. Даўж. каля 400 км. Выш. да 5539 м. Складзены з пясчана-гліністых парод і крышт. сланцаў. Пераважае высакагорны рэльеф. На схілах сухія кавыльна-ціпчаковыя стэпы, лугастэпы, арчоўнікі, вышэй — альпійскія лугі. Ледавікі (агульная пл. 811 км$^2$).

**АЛАКО́ЛЬ**, Алакуль, бяссцёкавае салёнае возера на У Казахстана, у паўпустыннай зоне. Пл. каля 2650 км². Глыб. да 54 м. Упадаюць рэкі Эмель, Жаманты, Урджар. Разам з мелкаводнымі азёрамі Уялы, Сасыкколь і Жаланашколь утварае Алакольскую азёрную сістэму з пл. бас. да 55 тыс. км².

**АЛАЛІ́Я**, гл. *Немата*.

**АЛА́МА-ДЭ-АРАГО́Н** (Alama de Aragon; ад араб. аль-хама цёплыя воды), бальнеалагічны курорт у Іспаніі. У даліне р. Халон, непадалёку ад г. Сарагоса. Тэрмальныя (да 35 °С) радонавыя воды выкарыстоўваюцца для лячэння хвароб органаў руху і апоры, дыхання, нырак, жоўцевых шляхоў і інш. Мінер. крыніцы былі вядомыя рымлянам і арабам.

**АЛАМАРФО́З**, гл. *Ідыядаптацыя*.

**АЛАМЕТРЫ́Я** (ад *ала...* + *...метрыя*), гетэрагонія, нераўнамерны рост асобных частак цела ў працэсе развіцця жывёльнага арганізма. Бывае адмоўнай (напр., запаволены рост галавы ў адносінах да ўсяго цела ў дзіцяці) і станоўчай (напр., паскораны рост рагоў у жвачных жывёл). Парушэнне ўзаемадзеяння паміж развіццём асобных частак арганізма жывёлы адбываецца пры хуткім павелічэнні агульных памераў цела за кошт простага прадаўжэння перыяду росту, без адначасовай перабудовы карэляцый.

**АЛА́НДСКІЯ АСТРАВЫ́**, Ахвенанма (швед. Aland, фін. Ahvenanmaa), архіпелаг з 6,5 тыс. а-воў і шхераў, на ПнУ Балтыйскага м., каля ўваходу ў Батнічны заліў. Пл. 1481 км², даўж. з Пн на Пд каля 130 км. Тэр. Фінляндыі. Нас. каля 23 тыс. чал. (1984). Складзены пераважна з гранітаў і гнейсаў. Паверхня ўзгорыстая (выш. да 132 м). Клімат умераны. Рыбалоўства, земляробства, жывёлагадоўля. Марскія курорты.

Да 1809 А.а. ў складзе Швецыі як частка яе правінцыі Фінляндыі. У маі 1718 — кастр. 1719 тут адбыліся перагаворы паміж Расіяй і Швецыяй (Аландскі кангрэс) адносна скончэння *Паўночнай вайны 1700—21*. У 1809—1917 разам з Фінляндыяй належалі Расіі. У 1921 Савет Лігі Нацый прызнаў суверэннае права Фінляндыі на А.а. Паводле Жэнеўскай канвенцыі 1921 А.а. — дэмілітарызаваная і нейтральная зона. Напярэдадні 2-й сусв. вайны Фінляндыя пабудавала тут ваен. ўмацаванні. Пасля 2-й сусв. вайны (з 1947) А.а. зноў дэмілітарызаваны.

**АЛАНІ́М** (ад *ала...* + грэч. onyma імя), чыё-небудзь сапраўднае імя, выкарыстанае іншай асобай як *псеўданім*. Напр., чылійскі паэт Пабла Нэруда сваё сапраўднае імя Рэес Басуальта Нефталі Рыкарда замяніў імем чэшскага пісьменніка Яна Нэруды.

**АЛАНІ́Н**, монаамінамонакарбонавая к-та; адна з замяшчальных *амінакіслот*. Існуе ў 2 формах: α-А. уваходзіць у склад многіх бялкоў жывёл і раслін, у свабодным стане прысутнічае ў крыві, β-А. — прадукт прамежкавага абмену амінакіслот, уваходзіць у склад некаторых біял. актыўных злучэнняў, напр., азоцістых экстрактыўных рэчываў шкілетнай мускулатуры — карназіну і анзерыну, каэнзіму А., пантатэнавай к-ты, у складзе бялкоў не трапляецца.

**АЛАНІ́Т**, мінерал; тое, што *артыт*.

**АЛА́НІЯ**, дзяржава *аланаў* у цэнтр. ч. Паўн. Каўказа ў пач. 10 — 1-й пал. 13 ст. Вылучылася з *Хазарскага каганата*. Гал. горад — Магас. На чале дзяржавы — цар (найб. вядомы Дургулель — візант. васал у 1-й пал. 11 ст.). У 10—12 ст. А. — адзін з найб. магутных саюзнікаў Візантыі. З 12 ст. А. — хрысц. краіна. Сепаратызм радавой арыстакратыі пры пераемніках Дургулеля аслабіў А. Як самаст. дзяржава перастала існаваць пасля сутыкнення з мангола-татарамі ў 1222 і 1238.

**АЛАНТО́ІС** (ад грэч. allantoeidēs каўбасападобны), адна з зародкавых абалонак вышэйшых пазваночных жывёл. У рэптылій і птушак зрастаецца з *харыёнам* і выконвае функцыі органа эмбрыянальнага дыхання і збору прадуктаў абмену рэчываў зародка. У млекакормячых у мезенхіме А. ўтвараюцца сасуды пупавіны, пазней з унутрызародкавай яго часткі фарміруецца мачавы пузыр.

Алайскі хрыбет. Вадаспад Абшыр.

**АЛАНХО́**, якуцкі гераічны эпас. Складаецца з многіх сказанняў, блізкіх паводле сюжэта, вобразаў і стылю, памерам 10—15 тыс. вершаваных радкоў. Частка тэксту — рытмізаваная проза і кароткія празаічныя ўстаўкі. Словы персанажаў спяваюцца, астатні тэкст выконваецца рэчытатывам, часта без інструмент. суправаджэння. А. адлюстроўваюць рысы патрыярхальна-радавога ладу, міжрадавыя і міжплемянныя адносіны якутаў. У аснове сюжэтаў — барацьба асілкаў з племені айыы аймага са злоснымі аднарукімі ці аднаногімі пачварамі, абарона справядлівасці і мірнага жыцця. У А. паяднаны фантастыка і гіпербалізацыя ў паказе асілкаў з рэаліст. апісаннямі побыту, шматлікія міфы стараж. паходжання.

*Літ.*: Пухов И.В. Якутский героический эпос олонхо. М., 1962.

**АЛА́НЫ**, вялікі плямённы саюз сармацкага паходжання. Жылі на Паўд. Урале, напаўкачэўнікі. У 1 ст. да н.э. прасунуліся ў паўд. стэпы. У 370-я г. разгромлены гунамі і адцеснены да Паўн. Каўказа. Частка А. рушыла на З, у 406 перайшла р. Рэйн, разам з *вандаламі* і *свевамі* ўварвалася ў рым. прав. Галію. У 411 заваявалі Іспанію, адкуль у 429 іх выцеснілі *вестготы*. Рэшткі разбітых А. і вандалаў заваявалі Паўн. Афрыку і ўтрымлівалі яе да 534. Удзельнічалі ў бітве на *Каталаунскіх палях*. Каўказскія А. ў 7 ст. трапілі пад уладу *хазараў*. У пач. 10 ст. заснавалі самаст. дзяржаву *Аланію*. Да сярэдзіны 10 ст. склалі народнасць. Пасля манг.-тат. нашэсця ў канцы 1230-х г. мігрыравалі ў Грузію, Візантыю і Венгрыю; астатнія перайшлі далей у горы. Нашчадкі гэтых А. — сучасныя *асеціны*.

**АЛАПАТРЫ́Я** (ад *ала...* + грэч. patris радзіма), тып відаўтварэння, пры якім новыя віды ўзнікаюць ва ўмовах прасторавай раз'яднанасці папуляцый. Пад дзеяннем *натуральнага адбору* кожная папуляцыя дадзенага віду прыстасоўваецца да спецыфічных умоў яе месцапражывання. Адаптацыя да новых умоў і выпадковы дрэйф генаў у невял. папуляцыях прыводзяць да змены частаты алеляў і генатыпаў. У выніку працяглага раз'яднання папуляцый паміж імі можа ўзнікнуць генетычная ізаляцыя, якая захоўваецца нават у тым выпадку, калі яны зноў апынуцца разам. Такім чынам могуць утварацца новыя віды. Напр., разнастайнасць відаў уюркоў сям. Goespizidae і пашырэнне на а-вах Галапагас лічаць вынікам алапатрычнага відаўтварэння. Гл. таксама *Сімпатрыя*.

**АЛАПОЛІПЛАІДЫ́Я** (ад *ала...* + *поліплаідыя*), спадчынная змена ў клетках раслін, радзей жывёл, звязаная з кратным павелічэннем набораў храмасом, якія належаць розным відам або родам. Абумоўлена спантаннай або выкліканай у эксперыменце геномнай *мутацыяй*. Адбываецца найчасцей пры міжвідавой гібрыдызацыі. Мае асаблівае значэнне ў працэсах відаўтварэння ў раслін. Алапаліплоіды, якія ўтвараюцца праз цотнае павелічэнне храмасомных набораў пры скрыжаванні двух відаў або родаў, наз. амфідыплоідамі (напр., капуснарэдзькавыя, аржана-пшанічныя, трыцікале і інш. выкарыстоўваюцца ў селекцыі).

**АЛА́Р** (Aulard) Франсуа Віктор Альфонс (19.7.1849, Манброн, Францыя — 23.10.1928), французскі гісторык. Замежны чл.-кар. Рас. АН (з 1924). Па адукацыі філолаг. Даследчык франц. рэвалюцыі 1789—94. У 1886—1922 узначальваў кафедру гісторыі Рэвалюцыі ў Сарбоне. У працы «Палітычная гісторыя Французскай рэвалюцыі. Паходжанне і развіццё дэмакратыі і рэспублікі» (1901) разглядаў ход рэвалюцыі з пазіцый ідэйнай барацьбы, лічыў перыяд Консульства працягам рэвалюцыі. З пач. 1900-х г. даследаваў праблемы эканам. і сац. гісторыі рэвалюцыі.

**АЛАРМІ́ЗМ** (ад англ. alarm трывога, жах), плынь у зах. навуцы і грамадскай думцы, прадстаўнікі якой сцвярджаюць пра фатальны, катастрафічны характар уздзеяння чалавека на прыроду, яго асаблівую небяспеку для далейшага развіцця чалавецтва і акцэнтуюць увагу на неабходнасці прыняцця неадкладных рашучых захадаў у мэтах аптымізацыі адносін у сістэме «прырода — грамадства». Рысы А. ў значнай ступені выявіліся ў дзейнасці ў 1970—80-я г. т.зв. *«Рымскага клуба»*, членамі якога былі многія вядомыя вучоныя і дзеячы розных краін.

**АЛА́РЫХ I** (Alaricus, Alarich; каля 370—410), кароль *вестготаў* [395—410]. У 395 пранік у Фракію, захапіў Афіны, разбурыў Карынф, Аргас, Спарту, Рым. Імператар Аркадзій заключыў з ім мір і прызначыў намеснікам Іліры, дзе ў якасці *федэратаў* былі паселены вестготы. У 401 А. узняў паўстанне, уварваўся ў Італію, але, разбіты *Стыліконам*, адступіў. У 408 тройчы асаджаў Рым, 24.8.410 захапіў яго і разрабаваў. Памёр у Паўд. Італіі, рыхтуючыся да паходу ў Сіцылію і Афрыку.

**АЛА́СЫ**, плоскія катлавінападобныя прасадкавыя паніжэнні ў раёнах шматгадовай мерзлаты Усх. Сібіры (Якуція) памерам ад дзесяткаў квадратных метраў да соцень квадратных кіламетраў. Глыб. 15—30 м. Узнікаюць ад раставанняпадземных ільдоў і апускання грунту (тэрмакарст і суфозія). Астаткавыя азёры. Лугі, стэпавая расліннасць. Сенажаці. Месцамі ўзараныя.

**АЛА́Т**, ал-Лат, Алілат, Лат, Ілат, у старажытнаарабскай міфалогіі багіня неба і дажджу. У пантэоне арабаў Сірыйскай пустыні А. — жаночая паралель *Алаха*, яго жонка і маці багоў. У г. Таіф, дзе А. шанавалася як багіня-апякунка, знаходзіліся яе свяцілішчы, храм і ідал (белы гранітны камень з упрыгожваннямі).

**АЛАТА́У**, Ала-Тоа (цюрк. літар. стракатыя горы), назва горных хрыбтоў у гарах Сярэдняй Азіі, Паўд. Сібіры, Урала (напр., Джунгарскі А., Заілійскі А., Кіргізскі А., Кузнецкі А.) з добра выяўленай *вышыннай пояснасцю*, на схілах якіх участкі, укрытыя расліннасцю, чаргуюцца са снежнікамі і ледавікамі, камяністымі россыпамі.

**АЛАТРО́ПІЯ** (ад *ала...* + грэч. tropos паварот, уласцівасць), існаванне аднаго і таго хім. элемента ў выглядзе двух або некалькіх простых рэчываў (алатропных мадыфікацый), якія адрозніваюцца па сваіх фіз. і хім. уласцівасцях. Можа быць вынікам утварэння малекул з рознай колькасцю атамаў, напр., азон ($O_3$) і кісларод ($O_2$) або крышталёў розных мадыфікацый, напр., алмаз і графіт. Прыватны выпадак *полімарфізму*. Вядома каля 400 алатропных мадыфікацый хім. элементаў.

**АЛАЎІ́ТЫ**, Алавіты, Філалідзі, Філалійскія шэрыфы, дынастыя султанаў (з 1660-х г.), потым каралёў (з 1957) у Марока. У перыяд франц. пратэктарата (1912—56) страцілі рэальную ўладу. З сак. 1956 аднавілі сваё кіраванне ў краіне.

Алярых I. Выява на пячатцы.

**АЛАФА́Н** (ад грэч. allophanes які здаецца іншым), мінерал, водны сілікат алюмінію непастаяннага саставу; $Al_2O_3 \cdot 1,2SiO_2 \cdot 3,3H_2O$. Аморфны. Утварае рыхлыя, шчыльныя, шклопадобныя нацёкі і інш. Колер белы, блакітны, зялёны, буры. Цв. 1—3. Вельмі крохкі. Шчыльн. 1,9 г/см$^3$. Утвараецца пры разбурэнні сілікатаў і алюмасілікатаў пад уздзеяннем сернай кіслаты.

Алафан.

**АЛА́Х** (ад араб. ілах бажаство), адзіны бог у *ісламе*. Паводле мусульманскага веравучэння А. — творца ўсяго існага: неба, зямлі і чалавека, усемагутны валадар свету, гаспадар суднага дня; чалавек павінен яму пакарацца. А. прыпісваюць найлепшыя якасці, якія выказаны ў 99 эпітэтах (міласцівы, міласэрны, вялікі, мудры і інш.).

**АЛАХАБА́Д**, горад у паўн. ч. Індыі, у штаце Утар-Прадэш, пры зліцці рэк Ганг і Джамна. 650 тыс. ж. (1981). Транспартны вузел. Харчасмакавая прам-сць, вытв-сць прадметаў рэліг. культу. Рэліг. цэнтр індуізму, дзе раз у 12 гадоў адбываюцца масавыя індуцкія рэлігійныя фестывалі «Кумбх-мела», святкаванні збана нектару бессмяротнасці (у рэках верующыя змываюць з сябе грахі і хваробы). Каменная калона цара Ашокі (каля 242 да н.э., выш. за 10 м); інш. гіст. помнікі. Ун-т.

**АЛАХТО́Н** (ад *ала...* + грэч. chthōn зямля), часткі складкавых структур горных парод, якія насунуты на нязрушаныя аўтахтонныя структуры (гл. *Аўтахтон*) і ўтвараюць *тэктанічнае покрыва*. Адрозніваецца ад перакрытых утварэнняў складам, генезісам, магутнасцю, узроўнем метамарфізму і інш.

**АЛАХТО́ННЫЯ АДКЛА́ДЫ**, горныя пароды, утвораныя з пераадкладзенага вадой, тэктанічнымі рухамі ці ледавіком зыходнага матэрыялу. Трапляюцца найчасцей у платформавым чахле. На Беларусі пашыраны алахтонныя бурыя вугалі (з прынесеных вадой рэшткаў раслін), пяскі алювіяльныя, ледавіковыя адорвені і інш. Вывучэнне А.а. мае значэнне ў палеагеаграфіі, палеанталогіі, геалогіі нафты.

**«АЛА́Ш»**, «Алаш-арда», палітычная партыя ў Казахстане ў 1917—20. Названа па імю міфічнага продка казахаў. Утварылася ў ліп. 1917, мела абл. адзяленні. Ідэалогія — *панісламізм* і *панцюркізм*. Дамагалася аўтаноміі Казахстана. У снеж. 1917 стварыла «партыйна-ўрадавы» цэнтр (урад) «Алаш-арда» на чале з А.Букейханавым (кадэт) і «Алашскую аўтаномію» (у ліст. 1918 скасавана *Уфімскай дырэкторыяй*), прыняла рашэнне пра стварэнне ўзбр. сіл. Атрады алаш-ардынцаў уваходзілі ў склад белагв. войскаў Дутава, Калчака, Аненкава і інш. У грамадз. вайну яе атрады разбіты, урад разгромлены ў сак. 1920 Кірг. (Казахскім) рэўкомам.

**АЛАША́НЬ**, пустыня ў Цэнтр. Азіі, у Кітаі, на ПнУ ад гор Наньшань. Пл. 170 тыс. км$^2$. Хвалістая раўніна (выш. 800—1660 м). Чаргуюцца групы невял. скалістых кражаў, драбнасопачніка і плоскіх выцягнутых паніжэнняў, занятых масівамі рухомых пяскоў, барханамі, салёнымі азёрамі, саланчакамі і такырамі. Цэнтр. ч. складзена з дакембрыйскіх парод, перакрытых плашчом чацвярцічных пяскоў; на ўзвышшах у паўд. і паўн. частках выходзяць на паверхню палеазойскія і мезазойскія ад-

клады. Радовішчы вугалю, нафты, соляў. Клімат рэзка кантынентальны. Рачная сетка прадстаўлена часовымі вадацёкамі, рэчышчы якіх напаўняюцца вадой толькі летам у перыяд мусонных дажджоў ці ліўневых ападкаў. Найб. рэкі Жашуй і Шуйхэ. Азёры Саго-Нур і Шара-Бурду. Асноўныя ландшафты: гобі — драбнасопачнік і астраўныя хрыбты, раскіданыя на раўніне з шчэбеневымі глебамі і рэдкай хмызняковай расліннасцю (парналіснік, эфедра і інш.); масівы барханных пяскоў з беднай стэпавай расліннасцю (карагава, салянкі, палын і інш.); цайдамы — паніжэнні з блізкімі грунтавымі прэснымі водамі і травяністай расліннасцю (рагоз, трыснёг, чарот, пажарніца); салончакі з галафільнай флорай (паташнікі, семітранкі, салянкі); саксаульнікі з чорнага саксаулу з семітранкамі ў ніжнім ярусе. Жывёльны свет: сайгакі, пустынны заяц, суслікі, пясчанкі, тушканчыкі, паўзуны (чарапахі, яшчаркі, змеі), трапляюцца дзікія аслы. Насельніцтва рэдкае. Качавая жывёлагадоўля.

**АЛА́ШСКАЕ ВО́ЗЕРА**, Алашкі, возера ў Беларусі, у Шаркоўшчынскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Дзісна. Пл. 0,2 км$^2$. Даўж. 1,15 км, найб. шыр. 0,2 км, найб. глыб. 12 м. Пл. вадазбору каля 9 км$^2$. Схілы выш. 5—7 м. Берагі забалочаныя. Зарастае. Сцёк з возера ў р.Дзісна.

**АЛА́ШСКАЕ ПЛАТО́**, у горнай сістэме Зах. Саянаў, на Пд Сібіры. Выш. да 3129 м (г. Бай-Тайга). Складзена пераважна з метамарфізаваных алеўралітаў, сланцаў, пясчанікаў і кангламератаў. Расчлянёна глыбокімі рачнымі далінамі са стромкімі скалістымі схіламі. На міжрэччах камяністыя стэпы; асобныя гальцовыя вяршыні; на схілах лістоўнічна-кедравыя лясы.

**АЛБА́НІЯ** (Shqipëria), Рэспубліка Албанія (Republika e Shqipërisë), дзяржава ў Паўд. Еўропе, на З Балканскага п-ва. Мяжуе на Пн з Югаславіяй, на У з Македоніяй, на ПдУ і Пд з Грэцыяй; на З абмываецца водамі Адрыятычнага і Іанічнага мораў. Праліў Отранта аддзяляе А. ад Італіі. Пл. 28,7 тыс. км$^2$. Нас. 3,4 млн. чал. (1994). Сталіца — г. *Тырана*. Падзяляецца на 26 адм. адзінак (рэці). Афіц. мова — албанская. Нац. свята — Дзень абвяшчэння незалежнасці Албаніі (28 ліст.).

**Дзяржаўны лад**. Паводле Закону аб асн. палажэннях канстытуцыі ад 29.4.1991 А. — парламенцкая рэспубліка. Кіраўнік дзяржавы — прэзідэнт. Вышэйшы орган дзярж. улады і заканад. орган — Нар. сход. Вышэйшы выканаўчы і распарадчы орган — Савет Міністраў.

**Прырода**. Пераважае горны рэльеф. На Пн — Паўн.-Албанскія Альпы (Праклетые), на У — хрыбты Таморы, Корабі (выш. да 2764 м), Дэшаты, Ябланіца, на Пд — адгор'і хр. Пінд. На астатняй тэр. краіны асобныя горныя масівы, на У катлавіна Корча. На ўзбярэжжы мора і цэнтр. частцы — узгорыстыя раўніны. Горы складзены з вапнякоў і сланцаў. Карысныя выкапні: нафта, прыродны газ, жалеза-нікелевыя, медныя і хромавыя руды, баксіты, бітум, буры вугаль, соль і інш. Клімат на раўнінах і на ніжніх схілах гор субтрапічны міжземнаморскі (сярэдняя т-ра студз. -8...-9 °С, ліп. 24—25 °С), у гарах — умераны; снегавое покрыва трымаецца тут некалькі месяцаў. Ападкаў 800—1000 мм на раўнінах, 1000—2000 мм у гарах. Рэкі горныя, кароткія і мнагаводныя; найбольшыя Дрын, Шкумбіні, В'ёса, Семані, Маты; частка належаць А. буйныя тэктанічныя азёры: Шкодэр (Скадарскае), Ахрыдскае, Прэспа. На раўнінах і ніжніх схілах гор — субтрапічныя хмызнякі і лясы, вышэй — шыракалістыя і хваёвыя лясы (пад лесам каля 43% тэр.), вышэй за 2000 м — альпійскія лугі.

**Насельніцтва**. Каля 97% — *албанцы*, жывуць таксама грэкі, македонцы, чарнагорцы, цыганы і інш. Сярод вернікаў — каля 70% мусульман-сунітаў і 30% хрысціян (20% праваслаўныя, 10% каталікі). Натуральны прырост каля 20 чал. на 1 тыс. чал. за год. Ва ўзроставай структуры насельніцтва больш за палавіну —асобы да 25 гадоў. Сярэдняя шчыльнасць насельніцтва 119 чал. на 1 км$^2$ (1994), на раўнінах да 200—300 чал. на 1 км$^2$. У прам-сці занята 53% самадз. насельніцтва, у сельскай гаспадарцы — 47%. Гар. насельніцтва 36,1% (1990). Буйнейшыя гарады (1990) — Тырана (243 тыс. ж.), Дурэс (85 тыс. ж.), Эльбасан (83 тыс. ж.), Шкодэр, Влёра. Сярэдняя працягласць жыцця мужчын 69, жанчын 73 гады. Узровень нараджальнасці 23 на 1 тыс. чал. насельніцтва. Дзіцячая смяротнасць 32,9 на 1 тыс. нованароджаных (1994).

**Гісторыя**. У 2-м тыс. да н.э. на тэр. А. жылі ілірыйцы, якія ў 4—3 ст. да н.э. ўтварылі сваю рабаўладальніцкую дзяржаву. З 2 ст. да н.э. А. ўваходзіла ў склад Рымскай, з 395 — Візантыйскай імперый. Нашэсце вестготаў і гунаў у канцы 4—5 ст. н.э., праніканне слав. плямёнаў у 6—7 ст. прывялі да разбурэння рабаўладальніцкага ладу, з 8 ст. пачалі фарміравацца феад. адносіны. У 9 — пач. 11 ст. А. ў складзе Першага балг. царства, пасля яго падзення (1018) — у складзе Візантыі. У 2-й пал. 11 ст. прыбярэжную ч. А. захапілі нарманы. У канцы 12 ст. на Пн А. ўзнікла незалежная алб. дзяржава — Арберыйскае княства. У гэты час з'явіўся этнонім «албанцы». Пазней А. ўваходзіла ў склад Эпірскага царства, Неапалітанскага і Сербскага каралеўстваў, была пад уладай Венецыі. З 14 ст. пачалося тур. заваяванне А. У 1443 барацьбу супраць туркаў узначаліў *Скандэрбег* (Георг Кастрыёці), які стварыў саюз алб. князёў і армію. Пасля яго смерці саюз распаўся, і да 1479 туркі захапілі амаль усю А. Іх панаванне і жорсткі прыгнёт прывялі да заняпаду гасп.-эканам. і культ. жыцця, да паўстанняў алб. народа ў 1481, 1537, 1571. У 2-й пал. 18 ст. на тэр. А. ўзніклі 2 паўнезалежныя феад. дзяржавы: фактычна незалежнымі кіраўнікамі паўн. і цэнтр. А. ў 1757—1831 былі прадстаўнікі алб. феад. роду Бушаці; паўд. А.,

Алахабад. Рэлігійны фестываль «Кумбх-мела».

Эпірам і Фесаліяй у 1787—1822 кіраваў *Алі-паша Тэпеленскі*. Аднак тур. ўлады падпарадкавалі і гэтыя раёны. У сярэдзіне 19 ст. пачаўся рух алб. адраджэння. У 1878 узнікла Албанская ліга і абвясціла сябе ўрадам. Пасля разгрому лігі кіруючая роля ў вызв. руху перайшла да асветных т-ваў, створаных за мяжой. На пач. 20 ст. нац.-вызв. рух актывізаваўся (гл. *Албанскае паўстанне 1912*). У час 1-й Балканскай вайны, калі паўстала пытанне пра падзел А. паміж Сербіяй, Грэцыяй і Чарнагорыяй, сход прадстаўнікоў розных раёнаў краіны абвясціў 29.11.1912 незалежнасць А., быў сфарміраваны ўрад на чале з І.Кемалі. Краіны Антанты, фармальна прызнаўшы незалежнасць А., у 1913 устанавілі над ёю пратэктарат. У 1-ю сусв. вайну, нягледзячы на абвешчаны нейтралітэт, тэр. А. акупіравалі італьян., грэч. і серб. войскі, а сакрэтны Лонданскі дагавор 1915 паміж краінамі Антанты і Італіяй ліквідаваў незалежнасць А. 21—31.1.1920 алб. Нац. кангрэс пацвердзіў незалежнасць А. Да ўлады прыйшла групоўка на чале з феадалам А.Зогу, антынар. палітыка якой выклікала незадаволенасць у краіне. У чэрв. 1924 у А. адбылося паўстанне пад кіраўніцтвам арг-цыі «Башкімі». Новы ўрад на чале з Ф.Нолі распрацаваў праграму дэмакр. рэформаў. У снеж. 1924 урад Нолі быў скінуты Зогу. 25.1.1925 А. абвешчана рэспублікай, Зогу — яе прэзідэнтам, а 1.9.1928 — каралём. У краіне ўсталяваўся дыктатарскі рэжым, у яе эканоміцы панаваў італьян. капітал. У крас. 1939 — вер. 1943 А. акупірована фаш. Італіяй. У краіне разгарнуўся рух Супраціўлення, у якім удзельнічалі партыі камуністычная, «Балі камбетар», «Легалітэт» і інш. Летам 1943 з партыз. атрадаў сфарміравана Нац. вызв. армія. Пасля капітуляцыі Італіі А. акупіравала фаш. Германія (вер. 1943 — ліст. 1944). 25.4.1944 на кангрэсе ў г. Перметы створаны Антыфаш. нац.-вызв. к-т А., які 20.10.1944 пераўтвораны ў Часовы дэмакр. ўрад на чале з *Э.Ходжам*. 11.1.1946 А. абвешчана Нар. рэспублікай, 14.3.1946 прынята канстытуцыя. Праведзена агр. рэформа, нацыяналізаваны прадпрыемствы, банкі, транспарт, абвешчаны пераход да планавай гаспадаркі і будаўніцтва сацыялізму. Але камуніст. партыя А. (з 1948 Албанская партыя працы) устанавіла таталітарны рэжым. У 1961 улады краіны, незадаволеныя крытыкай культу асобы Сталіна, разарвалі дыпламат. адносіны з СССР, у 1978 — са сваім асн. ідэалаг., знешнепаліт. і эканам. партнёрам Кітаем і апынуліся ў поўнай ізаляцыі ад знешняга свету. У снеж. 1976 прынята новая канстытуцыя, краіна перайменавана ў Нар. Сацыялісц. Рэспубліку А. Пасля смерці Ходжы (1985) Алб. партыю працы ўзначаліў Р.Алія, які пачаў адыход ад сталінскай і кітайскай мадэляў сацыялізму, ад палітыкі самаізаляцыі. З 1989 у А. пачаўся працэс распаду таталітарнай сістэмы. Дэмакратызацыі грамадска-паліт. жыцця спадарожнічала абнаўленне дзярж.-прававых структур, узнікла легальная апазіцыя, якая аформілася ў паліт. партыі. У сак. 1991 адбыліся першыя парламенцкія выбары на шматпарт. аснове. У кастр. 1991 прынята новая канстытуцыя, краіна стала называцца Рэспублікай Албаніяй. Аднак няўстойлівасць унутрыпаліт. і эканам. сітуацыі прывяла да змены трох урадаў і правядзення ў сак. 1992 датэрміновых парламенцкіх выбараў. Прэзідэнт А. — С.Берыша, прэм'ер-міністр — А.Мексі (з крас. 1992). А. — член ААН (1955), АБСЕ (1991), Арганізацыі ісламскай канферэнцыі (1992). Дыпламат. зносіны з Рэспублікай Беларусь устаноўлены 17.5.1993.

Герб і сцяг **Албаніі**.

**Палітычныя партыі**: Дэмакратычная партыя Албаніі (дамінуе ў кіраванні краінай), *Албанская сацыялістычная партыя*, Сацыял-дэмакр. партыя А., Саюз за правы чалавека, Алб. рэсп. партыя, Алб. дэмакр. альянс і інш.

**Гаспадарка**. Эканамічна найменш развітая краіна Еўропы. Прам-сць дае 67% валавой прадукцыі. Выт-сць электраэнергіі 5,0 млрд. кВт·гадз (1992), ГЭС на рэках Дрын, Маты. Развіта горназдабыўная прам-сць: хрампіаў (больш за 1 млн. т у 1990, вядучае месца ў Еўропе), меднай руды (каля 1 млн. т), бурага вугалю (2,1 млн. т), нафты (1,1 млн. т), азбесту (0,6 млн. т), прыроднага бітуму. Вядзецца нафтаперапрацоўка (Сталін, Фіеры, Цэрык). Ёсць чорная і каляровая металургія (Эльбасан, Бурэлі, Лячы, Шкодэр), хім. прам-сць (пераважна выт-сць угнаенняў, соды ў Фіеры, Лячы, Влёры), маш.-буд. і металаапр. (Тырана, Дурэс, Эльбасан), лесапільная, дрэваапр. і папяровая прам-сць (Пн і цэнтр краіны). Вядучае месца па аб'ёме прадукцыі займаюць харч. і лёгкая прам-сць. Вылучаецца выт-сць аліўкавага алею, тытунёвых вырабаў, кансерваў з садавіны. Ёсць прадпрыемствы тэкст. (Тырана, Берат), трыкат. (Корча), гарбарна-абутковай (Тырана, Дурэс), цэментнай (Тырана) прам-сці. У сельскай гаспадарцы пераважае земляробства. Пасяўная пл. 704 тыс. га, каля палавіны яе штучна арашаецца (1990). Пераважаюць збожжавыя культуры (пшаніца, кукуруза, рыс, ячмень), меншая плошча пад тэхн. культурамі (тытунь, сланечнік, цукр. буракі, соя), бульбай і гароднінай. Развіта садоўніцтва (значныя плошчы пад аліўкамі) і вінаградарства. Гал. раёны земляробства — З краіны і катлавіна Корча. Жывёлагадоўля (буйн. раг. жывёла, авечкі, козы, свінні) горна-пашавая. Гал. від транспарту аўтамабільны. Працягласць аўтадарог 7,5 тыс. км, у тл. 2,9 тыс. км асфальтаваных, чыгункі 720 км. Гал. марскія парты Дурэс, Влёра, Саранда. Знешнегандлёвы абарот 6,1 млрд. лекаў (1990), у тл. экспарт — 2,3, імпарт — 3,8 млрд. А. экспартуе храміты, медзь, нафтапрадукты, асфальт, прадукты жывёлагадоўлі, тытунь, масліны, цытрусавыя, драўніну і інш.; імпартуе машыны і прамысл. абсталяванне (31% імпарту), харч. прадукты (пераважна збожжа), медыкаменты і інш. Гандл. партнёры: Італія, Германія, краіны Балканскага п-ва і Усх. Еўропы. Грашовая адзінка — лек.

**Узброеныя сілы** А. налічваюць 48 тыс. чал. (1991), складаюцца з сухапутных войскаў, ВПС і ВМС. Вярх. галоўнакамандуючы — прэзідэнт. У сухапутных войскаў на ўзбраенні танкі, палявая і зенітная артылерыя, стралк. зброя; у

ВПС — баявыя і трансп. самалёты, верталёты; у ВМС — падводныя лодкі, караблі і катэры розных класаў. Ваенна-марская база — Влёра. Камплектуюцца ўзбр. сілы паводле закону аб усеагульным воінскім абавязку, прызыўны ўзрост — 18 гадоў. Тэрмін абавязковай ваен. службы ў сухапутных войсках — 2, у ВПС, ВМС і спец. часцях — 3 гады. Афіцэрскія кадры рыхтуюць у ваен. вучылішчах і акадэміі. Ёсць таксама ваенізаваныя арг-цыі і падпарадкаваныя МУС войскі ўнутр. бяспекі, пагранвойскі.

**Асвета, навуковыя ўстановы.** У 1989 у А. больш за 3,2 тыс. дашкольных дзіцячых устаноў (121 тыс. дзяцей да 5 гадоў). 1,7 тыс. пач. школ (547 тыс. вучняў, 27,9 тыс. настаўнікаў), 43 сярэднія агульнаадук. школы (больш за 59 тыс. вучняў, 1,8 тыс. настаўнікаў). Прафес. адукацыю даюць ніжэйшыя (1—2-гадовыя) і сярэднія (3—4-гадовыя) прафшколы і тэхнікумы на базе няпоўнай сярэдняй школы (у іх вучылася больш за 135 тыс. чал.). У ВНУ — Тыранскі дзярж. ун-т (засн. ў 1957), 2 с.-г., 3 пед. ін-ты, тэатральны, выяўл. мастацтваў, заатэхнічны, фіз. культуры, кансерваторыя — займаліся 25 тыс. студэнтаў. Буйнейшыя б-кі: Нац. ў Тыране, універсітэцкая. Музеі: археалагічны, этнагр., барацьбы за нац. вызваленне, гістарычны. Навук. даследаванні вядуцца ў ін-тах Акадэміі навук (засн. 1973), на ф-тах ун-та.

**Друк, радыё, тэлебачанне.** З некалькіх дзесяткаў перыяд. выданняў найбуйнейшыя газеты: «Zeri i Popullit» («Голас народа»), «Republika» («Рэспубліка»), «Alternativa» («Альтэрнатыва»), «Bashkimi» («Адзінства»). Дзярж. інфарм. агенцтва — Алб. тэлегр. агенцтва (ATA, з 1944). Тэлебачанне з 1960. Дзейнічае дзярж. арг-цыя «Албанскае радыёвяшчанне і тэлебачанне». Цэнтр. радыёстанцыя — «Тырана». Працуюць радыёстанцыі ў некаторых абл. цэнтрах.

**Літаратура.** Вытокі алб. л-ры ў фальклоры. Лічыцца, што стараж. пласт культуры і пісьменства знішчаны тур. заваёўнікамі. Самы ранні пісьмовы твор — «Формула хрышчэння» (1462) епіскапа Паля Энгелы. У канцы 15 — пач. 16 ст. атрымалі вядомасць працы гістарыёграфаў і гуманістаў, у т.л. «Гісторыя жыцця і подзвігаў Скандэрбега» (1508—10) М.Барлеці. Першую друкаваную кнігу на алб. мове — службоўнік «Мэшары» (1555) — склаў і выдаў Г'ён Бузуку. Паслядоўнікамі яго былі: П.Будзі — буйнейшы прадстаўнік паэзіі алб. барока, рэфарматар пісьма, аўтар духоўна-асв. кніг «Хрысціянская дактрына» (1618) і «Рымскі рытуал» (1621); Ф.Бардзі — складальнік першых лац.-алб. слоўніка (1635), зб. фальклору, жыцияпісу нац. героя Скандэрбега; П.Багдані — аўтар багаслоўскіх прац. На працягу стагоддзяў тур. панавання ў л-ры трохканфесіянальнага алб. народа назіралася збліжэнне з суседнімі культурамі: паэты-«бэйтэджы» трымаліся пераважна перс. і тур. узораў, грэкафілы цягнуліся да ант. і візант. традыцый, «арберэшы» (алб. эмігранты ў паўд. Італіі) былі прыхільнікамі рымска-каталіцкага кірунку развіцця. Уздым алб. л-ры прыпадае на 19 ст., праяўляецца ў плыні рамантызму. Найб. значныя прадстаўнікі К.Крыстафарыдзі, І.Дэ Рада, З.Серэмбе, В.Шкадрані (П.Васа), Ф.Мітка, С.Фрашэры. Заснавальнікам новай алб. л-ры лічыцца паэт Наім Фрашэры. У пач. 20 ст. ў л-ры ўсталёўваецца метад крытычнага рэалізму, пераважае публіцыстыка. Сярод найб. прызнаных пісьменнікаў перыяду паміж сусв. войнамі А.Чаюпі (А.Чака), Асдрэні (А.С.Дранова), Мігені (М.Д.Нікола), М.Грамена, Ф.Нолі. Дасягненні алб. л-ры сацыяліст. перыяду звязаны з імёнамі Дз.Шутэрычы, Ш.Мусарая, С.Спасе, Ф.Арапі, І.Кадары. Пасляваен. пакаленне прадстаўляюць: М.Каламата, В.Какона, К.Буджэлі, Дз.Джувані, Т.Ляча, Б.Муча. Л-ра на алб. мове ствараецца таксама прадстаўнікамі алб. нац. меншасці, якія жывуць у Югаславіі (краі Косава, Метохія).

Да арт. **Албанія.** Кварталы Тыраны.

**Архітэктура і выяўленчае мастацтва.** Найб. стараж. помнікі мастацтва на тэр. А. адносяцца да 1-га тыс. да н.э. Ад ант. эпохі (з 7 ст. да н.э.) захаваліся рэшткі абарончых збудаванняў, грамадскіх і жылых дамоў, мазаік і керамікі на месцах грэч. калоній (Апалонія Ілірыйская, Бутрынт, Дурэс і інш.), рымскіх умацаваных гарадоў (Эльбасан і інш.). У царк. архітэктуры сярэднявечча ў цэнтры і на Пд пераважалі збудаванні візант. тыпу (цэрквы ў вёсках Ляўдары і Мбор'я, 13—14 ст., у г. Васкапоя, 17—18 ст.); на Пн, дзе быў пашыраны каталіцызм, — раманскага тыпу (сабор у в. Шасі, цэрквы ў вёсках Вау-і-Дэес і Аботы, усе 13 ст.). З пашырэннем у 17 ст. ісламу ў гарадах з'яўляюцца мячэці, палацы знаці (сараі), крытыя рынкі (безыстэні). Да сярэдзіны 20 ст. ў большасці гарадоў А. пераважалі 2-павярховыя, мураваныя або з мураваным ніжнім і дашчаным верхнім паверхамі жылыя дамы, крытыя чарапіцай. У горных раёнах да пач. 20 ст. ўзводзіліся «кулы» — вежападобныя збудаванні з нявыяснымі байніцамі. Выяўл. мастацтва А. ў сярэднявеччы развівалася пад уплывам Візантыі. Раннія помнікі фрэскавага жывапісу адносяцца да 12—14 ст. (размалёўка царквы Тройцы ў в. Ляўдары і інш.). З 16 ст. заўважаецца ўплыў

Да арт. **Албанія.** Албанская Рыўера.

італьян. Адраджэння, узмацніліся рэаліст. тэндэнцыі (размалёўкі Ануфрыя з Неакастра, Давіда з Селеніцы). З канца 18 ст. да пач. 20 ст. асноўным відам выяўл. мастацтва быў іканапіс, які прытрымліваўся візант. традыцый. У 2-й пал. 19 ст. з'явіліся творы станковага жывапісу (Н.Марціні, С.Дзега), у 1920-я г. — скульптура (першы алб. скульптар А.Паскалі). У 1940—50-я г. ў жывапісе і скульптуры ўзмацніўся рэаліст. кірунак, развіваліся гіст., бытавы, партрэтны, пейзажны жанры (мастакі С.Рота, В.Міо, Н.Займі, С.Кацэлі, скульптары Я.Пача, Л.Нікола і інш.), з'явіліся кніжная ілюстрацыя, плакат. Нар. дэкар.-прыкладное мастацтва А. прадстаўлена традыц. філіграннымі сярэбранымі ўпрыгожаннямі, шарсцянымі бязворсавымі дыванамі, паліхромнай разьбой па дрэве, дэкар. размалёўкамі.

**Музыка.** Народнае муз. мастацтва фарміравалася пад уплывам суседніх балканскіх і італьян. культур, элементаў турэцкай музыкі. Разнастайны ў жанравых і стылявых адносінах песенны і песенна-танцавальны фальклор мае рэгіянальныя адрозненні, вылучаюцца паўд., цэнтр. і паўн. традыцыі. Сярод муз. інструментаў найб. пашыраны струнныя — чыфтэлі, ляхута, скрыпка, духавыя — зумарэ, кларнет, гайда (валынка), ударныя — даулэ, барабаны і бубны. Прафес. муз. культура А. развіваецца з 1940-х г. У 1950—60-я г. створаны першыя оперы («Мрыка» К.Кона, 1958), балеты («Халіль і Хайрыя» Ч.Задэі, 1963), аперэты («Світанне» Кона, 1954), сімфанічныя, вак.-сімф. і камерна-інстр. творы. Сфарміраваліся выканальніцкая і кампазітарская школы: кампазітары Кона, Задэя, Н.Зарачы, Д.Лека, К.Трака, П.Якова, Т.Дая, Т.Харапі, Ф.Ібрахімі, К.Ляра, спевакі М.Края, А.Муля, І.Тукічы, дырыжоры М.Кранцья, М.Вака і інш. У Тыране працуюць Маст. ліцэй з муз. аддзяленнем (з 1947), філармонія (1950), Т-р оперы і балета (1956), Дзярж. ансамбль песні і танца (1958), кансерваторыя (1962). Саюз пісьменнікаў і дзеячаў мастацтва (з секцыяй музыкі, 1956).

**Тэатр.** Вытокі сучаснага алб. т-ра ў стараж. культуры ілірыйцаў. Першыя тэатр. прадстаўленні ў А. адбыліся ў канцы 19 ст. Творы нац. драматургаў С.Фрашэры, А.Чаюпі і інш. у пач. 20 ст. ставілі аматарскія трупы. У 2-ю сусв. вайну ў час італьян. акупацыі ўзніклі тэатр. гурткі ў партыз. атрадах; у 1944 у г. Перметы арганізавана Цэнтр. тэатр. трупа пры Нац. вызв. арміі. У 1945 створаны першы прафес. т-р — Дзярж. тэатр (народны тэатр) у Тыране. У рэпертуары п'есы алб. драматургаў К.Яковы, Б.Левоні, С.Пітаркі, Ф.Г'яты, а таксама У.Шэкспіра, Ф.Шылера, Ж.Б.Мальера. Прафес. т-ры створаны таксама ў Шкодэры, Корчы, Дурэсе. Сярод тэатр. дзеячаў: С.Міо, П.Стылу, М.Поні, Л.Кавачы, Л.Філіпі, Б.Імамі. З 1959 у Тыране працуе Вышэйшае акцёрскае вучылішча імя А.Моісі.

**Кіно.** Кінематаграфія ў А. пачалася ў 1950-я г. з хранік. фільмаў. У 1952 пабудавана кінастудыя «Новая Албанія» (Тырана). Сумесная праца алб. і сав. кінематаграфістаў над фільмам «Вялікі воін Албаніі Скандэрбег» (1954, прэмія Міжнар. кінафестывалю ў Кане) — першая спроба ў галіне маст. кінематаграфіі. З 1958 наладжаны выпуск маст. поўнаметражных карцін («Тана», «Зямля ў полымі», «Група Супраціўлення», «Аперацыя — агонь», «Канцэрт у 1936 годзе»), здымаюцца навукова-папулярныя фільмы. Сярод рэжысёраў К.Дама, Г.Гакані, М.Фейза, Г.Эрэбара.

*В.М.Сасноўскі* (прырода, гаспадарка), *В.І.Сініца* (гісторыя), *І.А.Чарота* (літаратара), *А.М.Гарахавік* (музыка).



Да арт. **Албанія.** Тэатр у Бутрынце. 3 ст. да н.э. Ануфрый з Неакастра. Давід. Дэталь фрэскі царквы св. Мікалая ў с. Шэльцан. Сярэдзіна 16 ст.

Да арт. **Албанія.** Коннікі Скандэрбега штурмуюць Крую. З нямецкай гравюры 16 ст.

**АЛБА́НІЯ КАЎКА́ЗСКАЯ,** Аран, стараж. дзяржава ва Усх. Закаўказзі ў 4—3 ст. да н.э. — 10 ст. н.э. (у ніжнім цячэнні Аракса і Куры). Сталіцы Кабалака, Партаў (Барда), Ардэбіль. Першапачаткова саюз роднасных плямёнаў (албаны, уції, каспіі і інш.), пазней рабаўладальніцкая, каля 3—5 ст. н.э. феад. дзяржава. Найб. магутнасці дасягнула ў час праўлення цара Урнайра (370-я г.), які распаўсюдзіў у А.к. хрысціянства. У пач. 5 ст. з'явілася алб. пісьменнасць. З канца 4 ст. пад уладай Сасанідскага Ірана, супраць якога ў 451, 484, 571 адбыліся паўстанні. У 7 ст. іранскае панаванне змянілася візант. і хазарскім. У 713 заваявана арабамі. У 9 ст. распалася на княствы і з пач. 10 ст. большасць зямель А.к. увайшла ў склад *Шырвана* і інш. дзяржаў.

**АЛБА́НСКАЕ ПАЎСТА́ННЕ 1912,** усеагульнае паўстанне хрысц. і мусульм. насельніцтва Албаніі супраць асманскага панавання. Пачалося ў сак. на Пн і ПнЗ (гал. яго ачаг знаходзіўся ў горным раёне каля г. Шкодэр), у ліп. ахапіла

Пд і цэнтр Албаніі. Аднак алб. феадалы, якія з мая ўзначалілі кіраўніцтва паўстаннем, адмовіліся ад ідэі поўнай незалежнасці Албаніі і заключылі пагадненне з тур. урадам, які абяцаў задаволіць некаторыя нац. патрабаванні албанцаў. У жн. кіраўнікі дамагліся спынення А.п.

**АЛБА́НСКАЯ ЛІ́ГА**, гл. *Прызрэнская ліга.*

**АЛБА́НСКАЯ МО́ВА**, самастойная група *індаеўрапейскіх моў.* Пашырана ў Албаніі (дзярж. мова), а таксама ў Югаславіі (аўт. край Косава), Італіі, Грэцыі, на Украіне (Адэская і Запарожская вобл.). Мяркуюць, што А.м. паходзіць ад адной са стараж. палеабалканскіх моў, генетычна найб. блізкая да ілірыйскай, месапскай і фракійскай моў. Мае 2 дыялекты: гегскі (паўн.) і тоскскі (паўд.), на аснове якіх у 19 ст. склалася сучасная літ. мова (у 2 варыянтах). У фанетычнай сістэме 7 галосных і 29 зычных фанем; націск фіксаваны пераважна на перадапошнім складзе. Граматычны лад флектыўна-сінтэтычны з рысамі аналітызму. Першыя пісьмовыя помнікі датуюцца 15 ст. Адзіны алфавіт на лац. аснове створаны ў 1908.

*Літ.:* Десницкая А.В. Албанский язык и его диалекты. Л., 1968; Эйнтрей Г.И. Албанский язык. Л., 1982.

**АЛБА́НСКАЯ САЦЫЯЛІСТЫ́ЧНАЯ ПА́РТЫЯ (АСП)**. Засн. ў 1941 як Камуністычная партыя Албаніі, у 1948—91 наз. Албанская партыя працы. У 1941—44 узначальвала барацьбу супраць італьян. і ням.-фаш. акупантаў. У 1948 прыняла праграму пабудовы сацыялізму. На практыцы гэта прывяло да стварэння казарменнай мадэлі грамадства, ізаляцыі ад знешняга свету, культу асобы Э.*Ходжы*, збяднення насельніцтва. У 1986 прынята праграма выхаду з крызісу. У сак. 1992 АСП, якая доўгі час была кіруючай партыяй, пацярпела паражэнне на ўсеаг. выбарах. У 1994 налічвала 130 тыс. чал., лідэр Ф.Нана. Цэнтр. орган — газ. «Zëri i Popullit» («Голас народа», з 1942). *А.А.Чалядзінскі.*

**АЛБА́НЦЫ** (саманазва шкіптар), нацыя, асн. насельніцтва *Албаніі* (каля 3 млн. чал.). 1,89 млн. А. жыве ў Косаве, Метохіі, Македоніі. Жывуць таксама ў Грэцыі, Італіі (паўд. вобласці і в-аў Сіцылія), Турцыі, Балгарыі, Румыніі, на Украіне. Агульная колькасць 5,19 млн. чал. (1987). Гавораць на *албанскай мове.*

**АЛБЕ́НА** (Албена), прыморскі кліматычны курорт у Балгарыі. За 30 км ад г. Варна, на беразе Чорнага м., непадалёку (14 км) ад курорта *Залатыя Пяскі.* Развіваецца з канца 1960-х г. Мяккі марскі клімат, малавоблачнае надвор'е, брызы, цёплае мора з працяглай паласой (5 км, шыр. да 500 м) пясчанага пляжа — спрыяльныя ўмовы для аздараўленчага адпачынку, клімата- і талаcатэрапіі. Шмат гасцініц, кемпінгаў, культ. і спарт. комплексы, прывязаныя да навакольнага ландшафту. Цэнтр адпачынку і міжнар. турызму, месца правядзення фестываляў.

**АЛБУКЕ́РКІ** (Albuquergue) Афонсу дэ (1453—16.2.1515), партугальскі мараплавец, намеснік (віцэ-кароль) партуг. уладанняў у Індыі [1510—15], заснавальнік партуг. калан. імперыі ў Ост-Індыі. У 1503 на чале партуг. флатыліі накіраваны ў інд. г. Кочын, дзе пабудаваў форт. У 1507 захапіў г. Армуз у Персідскім заліве. У 1510 захапіў Гоа (стаў асн. апорным пунктам партуг. заваёўнікаў на Усходзе), у 1511 — Малаку. А. ўзначальваў першыя партуг. экспедыцыі на Малабарскі бераг, в. Цэйлон, у краіны Паўд.-Усх. Азіі.

**АЛГАРЫ́ТМ** (Algorithmi — лац. транслітарацыя імя матэматыка аль-Харэзмі), адно з асноўных паняццяў *кібернетыкі*; прадпісанне выканання сістэмы аперацый ці дзеянняў у зададзеным парадку для дасягнення выніку, які вызначаецца зыходнымі дадзенымі. Дазваляе праводзіць аперацыі з лікамі, літарамі, дужкамі і інш. сімваламі, атрымліваць рашэнні задач «у агульным выглядзе» (прыдатныя для цэлага класа аднатыпных задач). Напр., правілы арыфм. дзеянняў з рацыянальнымі лікамі, А. знаходжання найб. агульнага дзельніка двух цэлых лікаў (А.Эўкліда), А. перакладу з адной мовы на другую. Уласцівасці А. вывучае *алгарытмаў тэорыя.*

У сярэдневяковай Еўропе А. наз. дзесятковую пазіцыйную сістэму злічэння і майстэрства лічэння ў ёй (лац. пераклад трактата аль-Харэзмі; 12 ст.). Развіццё электроннавыліч. тэхнікі дало магчымасць ствараць і рэалізоўваць складаныя А. ў матэматыцы і яе дастасаваннях. *В.А.Ліпніцкі.*

**АЛГАРЫ́ТМАЎ ТЭО́РЫЯ**, раздзел матэматыкі, які вывучае агульныя ўласцівасці *алгарытмаў*; тэарэт. аснова кібернетыкі, вылічальнай матэматыкі.

У інтуітыўным паняцці алгарытмы выкарыстоўваліся ў матэматыцы на працягу яе існавання. Дакладнае паняцце алгарытму сфарміравалася ў пач. 20 ст. і ўпершыню з'явілася ў працах матэматыкаў франц. Э.Барэля (1912) і ням. Г.Вейля (1921). Сістэматычная распрацоўка А.т. пачалася ў 1936, калі амер. матэматык А.Чэрч удакладніў паняцце алгарытмічна вылічальнай функцыі і прывёў прыклад невыліч. функцыі, англ. А. Цьюрынг і амер. Э.Пост удакладнілі паняцце алгарытму ў тэрмінах ідэалізаваных выліч. машын (машыны Цьюрынга—Поста); сав. матэматык А.М.Калмагораў прапанаваў выкарыстанне А.т. для абгрунтавання *інфармацыі тэорыі* (1965).

Адзін з гал. кірункаў А.т. — вывучэнне невырашальнасці (вырашальнасці) алгарытмічных праблем, напр., у самой А.т. — праблема спынення універсальнай машыны Цьюрынга; у матэм. логіцы — праблема распазнавання тоесна праўдзівых формул злічэння прэдыкатаў 1-й ступені; у алгебры — праблема тоеснасці для паўгруп; у тапалогіі — праблема гомеамарфізму; у тэорыі лікаў — 10-я праблема Д.Гільберта. Даследаванні прывялі да ўзнікнення паняцця ступені невырашальнасці, вывучэння адпаведных матэм. структур і паказалі, што алгарытмічныя праблемы невырашальнасці маюць найб. ступень.

*Літ.:* Мальцев А.И. Алгоритмы и рекурсивные функции. 2 изд. М., 1986; Ершов Ю.Л. Проблемы разрешимости и конструктивные модели. М., 1980.

*Р.Т.Вальвачоў.*

**АЛГАРЫТМІЗА́ЦЫЯ ПРАЦЭ́САЎ**, апісанне працэсаў на мове матэм. сімвалаў з мэтай атрымання *алгарытму* (звычайна для рэалізацыі на ЭВМ). Кожны працэс разбіваюць на элементарныя акты (падпрацэсы), якія можна матэм. апісаць на аснове схем алгебры логікі, аўтаматаў тэорыі, выпадковых працэсаў, масавага абслугоўвання тэорыі і інш. А.п. дае магчымасць праводзіць колькасныя і якасныя даследаванні працэсаў функцыянавання вял. сістэм, звязаныя з ацэнкай іх асн. уласцівасцяў (надзейнасці, эфектыўнасці і інш.).

Складаецца з папярэдняга аналізу задачы алгарытмізацыі і аб'екта даследавання; структурнага апісання даследвальнага працэсу; тэарэт. аналізу ўраўненняў сувязі паміж яго параметрамі; эксперым. вызначэння статычных і дынамічных параметраў; матэм. мадэлявання працэсу і выяўлення адпаведнасці мадэлі рэальнай сітуацыі; аналізу мадэлі і распрацоўкі рэкамендацый па яе ўдасканаленні; складання аптымальнага алгарытму на аснове распрацаваных рэкамендацый; праверкі і ўдакладнення алгарытму кіравання працэсам у вытв. мовах. Пры апрацоўцы вял. масіваў інфармацыі звычайна выкарыстоўваюць сродкі выліч. тэхнікі.

**АЛГАРЫТМІ́ЧНАЯ МО́ВА**, гл. ў арт. *Мова праграмавання.*

**А́ЛГЕБРА**, навука пра сістэмы аб'ектаў той ці інш. прыроды, у якіх устаноўлены аперацыі, па сваіх уласцівасцях падобныя на складанне і множанне лікаў (алг. аперацыі). Задачы і метады А. ствараліся паступова, у выніку пошукаў агульных прыёмаў рашэння аднатыпных арыфм. задач (пераважна састаўлення і рашэння *ўраўненняў*).

Вялікі ўплыў на развіццё алг. ідэй і сімволікі зрабіла «Арыфметыка» *Дыяфанта* (3 ст.). Тэрмін «А.» паходзіць ад назвы твора Мухамеда аль-Харэзмі «Альджэбр аль-мукабала» (9 ст.), які мае агульныя метады рашэння *алгебраічных ураўненняў* (АУ) 1-й і 2-й ступеняў. У канцы 15 ст. замест грувасткіх слоўных апісанняў алг. дзеянняў у матэм. творах з'яўляюцца знакі «+» і «-», потым знакі ступеняў, кораняў, дужкі. У канцы 16 ст. Ф.*Віет* першы выкарыстаў літарныя абазначэнні. Да сярэдзіны 17 ст. ў асн. склалася сучасная алг. сімволіка. У далейшым погляд на А. мяняўся. А. 17—18 ст. займалася літарнымі вылічэннямі (рашэнне АУ, тоеснае пераўтварэнне формул і інш.) у адрозненне ад арыфметыкі, якая аперыруе канкрэтнымі лікамі. Да сярэдзіны 18 ст. А. склалася прыблізна ў аб'ёме цяперашняй т.зв. элементарнай А. Алгебра 18—19 ст. з'яўляецца ў асн. А. мнагачленаў. Першай гіст. задачай А. было рашэнне АУ з адным невядомым. У 16 ст. італьян. матэматыкамі была знойдзена формула для рашэння ўраўненняў 3-й ступені (формула Кардана), потым метад рашэння ўраўненняў 4-й ступені (метад Ферары). Амаль 3 стагоддзі вёўся пошук формулы для рашэння

ўраўненняў вышэйшай ступені. У 17 ст. ўпершыню выказана А.Жырарам, а ў канцы 18 ст. К.*Гаўсам* даказана асн. тэарэма алгебры аб існаванні камплекснага кораня для адвольных АЎ з камплекснымі каэфіцыентамі. У 1824 Н.*Абель* даказаў, што ўраўненне вышэй 4-й ступені ў агульным выпадку ў радыкалах невырашальнае, а ў 1830 Э.*Галуа* знайшоў крытэрый вырашальнасці ў радыкалах АЎ. Разам з тэарэмай АЎ з адным невядомым разглядаліся сістэмы АЎ з многімі невядомымі, у прыватнасці сістэмы лінейных ураўненняў, у сувязі з чым узніклі паняцці *матрыцы* і *дэтэрмінанта*. З сярэдзіны 19 ст. даследаванні ў А. паступова пераносяцца з тэорыі АЎ да вывучэння адвольных алг. аперацый. Абстрактнае паняцце алг. аперацыі ўзнікла ў сярэдзіне 19 ст. ў сувязі з даследаваннем прыроды *камплексных лікаў*, а таксама ў выніку з'яўлення прыкладаў алг. аперацый над элементамі зусім інш. прыроды, чым лікі, — складанне і множанне матрыц і інш.

У пачатку 20 ст. А. стала разглядацца як агульная тэорыя алг. аперацый на аснове аксіяматычнага метаду (сфарміравалася пад уплывам прац Д.*Гільберта*, Э.Штэйніца, Э.Арціна, Э.Нётэр і інш.). Сучасная А. вывучае *мноствы* адвольнай прыроды з зададзенымі на іх алг. аперацыямі (г.зн. А. ці універсальныя А.). Доўгі час вывучаліся толькі некалькі тыпаў універсальных А. — *групы, кольцы*, лінейныя прасторы. Пазней пачалося вывучэнне абагульненняў паняцця групы — паўгрупы, квазігрупы і лупы. Разам з асацыятыўнымі кольцамі і А. пачалі вывучацца і неасацыятыўныя кольцы і А. Асацыятыўна-камутатыўныя кольцы і палі з'яўляюцца асн. аб'ектам вывучэння камутатыўнай алгебры, з якой цесна звязана *алгебраічная геаметрыя*. Важным тыпам А. з'яўляюцца структуры. Лінейныя прасторы, модулі, а таксама іх лінейныя пераўтварэнні і сумежныя пытанні вывучае *лінейная алгебра*, часткай якой з'яўляюцца тэорыі лінейных ураўненняў і матрыц. Да лінейнай А. прымыкае полілінейная А. Першыя працы па агульнай тэорыі адвольных універсальных А. належаць Г.Біркгафу (1830-я г.). У тыя ж гады А.І.Мальцаў і А.Тарскі заклалі асновы тэорыі мадэляў — мностваў з зададзенымі на іх адносінамі. У выніку цеснага збліжэння тэорыі універсальных А. з тэорыяй мадэляў узнік новы раздзел А., сумежны з А. і *матэматычнай логікай*, — тэорыя алг. сістэм, якая вывучае мноствы з зададзенымі на іх алг. аперацыямі і адносінамі (гл. *Алгебра логікі*). Дысцыпліны, сумежныя з А. і інш. часткамі матэматыкі, вызначаюцца ўнясеннем ва універсальныя А. дадатковых структур, узгодненых з алг. аперацыямі і адносінамі: *тапалагічная алгебра*, у т.л. тапалагічныя групы і групы Лі, тэорыя ўнармаваных кольцаў, дыферэнцыяльная А., тэорыі розных упарадкаваных А. Да сярэдзіны 1950-х г. сфарміравалася гамалагічная А., карані якой ляжаць у А. і тапалогіі.

Алг. паняцці і метады выкарыстоўваюцца ў геаметрыі, тэорыі лікаў, функцыян. аналізе, тэорыі дыферэнцыяльных ураўненняў, метадах вылічэнняў і інш. А. мае вял. дачыненне да фізікі (выяўленні груп у квантавай фізіцы), крышталяграфіі (дыскрэтныя групы), кібернетыкі (тэорыі аўтаматаў і кадзіравання), матэм. эканомікі (лінейныя нераўнасці) і інш. Сістэм. даследаванні па А. на Беларусі пачалі Дз.А.*Супруненка* (1945) і С.А.*Чуніхін* (1953). Вядуцца пераважна ў Ін-це матэматыкі АН Беларусі, БДУ, Гомельскім ун-це ў школах У.П.*Платонава*, А.Я.*Залескага*, Л.А.*Шамяткова*.

*Літ.:* Математика, её содержание, методы и значение. Т. 1—3. М., 1956; Бурбаки Н. Очерки по истории математики: Пер. с фр. М., 1963. *Р.Т.Вальвачоў.*

**АЛГЕБРА ЛО́ГІКІ**, раздзел *матэматычнай логікі*, які вывучае логікавыя аперацыі над выказваннямі. Заснавальнік — англ. матэматык Дж.Буль (1815—64). А.л. разглядае выказванні толькі з пункту гледжання іх праўдзівасці (пазначаюць лічбамі 1 — праўдзівасць і 0 — ілжывасць). Логікавыя аперацыі над выказваннямі даюць магчымасць будаваць новыя выказванні. Праўдзівасное значэнне такога выказвання A ($a_1$,..., $a_n$), атрыманага пры дапамозе логікавых аперацый з прасцейшых выказванняў $a_1$,..., $a_n$, адназначна выяўляецца праўдзівасными значэннямі зыходных выказванняў $a_1$,..., $a_n$. Таму кожнаму такому выказванню A ($a_1$,..., $a_n$) адпавядае n-ме́сцавая функцыя, якая прымае значэнні 0,1, аргументы яе таксама прымаюць гэтыя значэнні. Такія функцыі наз. функцыямі А.л., ці булевымі, функцыямі. Яны могуць быць зададзеныя з дапамогай праўдзівасных табліц, якія маюць $2^n$ радкоў.

Логікавыя аперацыі: кан'юнкцыя &, дыз'юнкцыя ∨, адмаўленне ¬, імплікацыя ⇒, эквіваленцыя ⇔ — могуць быць зададзеныя з дапамогай праўдзівасных табліц. Замест ¬x часам пішуць $\bar{x}$. Ужываецца заданне функцый А.л. і з дапамогай формул у мове, у якой ёсць пераменныя x, y, z... і сімвалы некаторых канкрэтных функцый. Найбольш ужывальная мова, якая мае логікавыя сімвалы &, ∨, ¬, ⇒, ⇔.Кожнай формуле гэтай мовы адпавядае нейкая функцыя А.л., значэнне (0,1) якой пры дадзеных значэннях пераменных (0,1) знаходзіцца ў адпаведнасці з аперацыямі, з якіх пабудавана дадзеная формула. Такая функцыя рэалізуе дадзеную формулу. Формулы A і B наз. роўнымі (раўназначнымі), калі адпаведныя ім функцыі роўныя, г.зн. калі супадаюць іх праўдзівасныя табліцы. Азначэнне A=B ці A≡B, A~B, калі кажуць пра іх раўназначнасць. Важную ролю ў А.л. маюць роўнасці, якія задаюць *булеву алгебру*.

Кожная функцыя А.л. можа быць рэалізаваная нейкай формулай мовы з логікавымі сімваламі &, ∨, ¬. Асаблівую ролю ў А.л. адыгрываюць дыз'юнктыўныя і кан'юнктыўныя нармальныя формы, якія маюць вял. прыкладное значэнне. Сістэма функцый Ф. наз. функцыянальна поўнай, калі адвольная функцыя А.л. можа быць рэалізаваная формулай, якая мае толькі сімвалы функцый з Ф. Напр., сістэмы функцый {&, ∨, ¬}, {&, ¬}, {∨, ¬}, {⇒, ¬}, {x | y}, {x ↓ y} функцыянальна поўныя (тут x | y = $\overline{x \,\&\, y}$, x ↓ y = $\overline{x \vee y}$, якія наз. штрыхам Шэфера і стрэлкай Пірса адпаведна).

А.л. мае шмат дадаткаў, асабліва ў тэорыі эл. схем. *Р.Т.Вальвачоў.*

**АЛГЕБРАІ́ЧНАЕ ЎРАЎНЕ́ННЕ**, ураўненне выгляду P(x, y,...,z)=0, дзе P(x, y,...,z) — мнагасклад n-ай ступені (n≥0) ад адной або некалькіх пераменных. Калі пераменная адна, то лік a, які ператварае А.ў. ў тоеснасць, наз. к о р а н е м у р а ў н е н н я і мнагасклад дзеліцца на (x-a) без рэшты (тэарэма Безу). У алгебраічна замкнёным полі (гл. *Алгебраічны лік*) кожны мнагасклад P(x) ступені n мае роўна n каранёў (у т.л. кратных). Н.*Абель* паказаў (1824), што пры n≥5 карані некаторых ураўненняў P(x)=0 нельга запісаць праз радыкалы. *В.І.Бернік.*

**АЛГЕБРАІ́ЧНАЯ ГЕАМЕ́ТРЫЯ**, раздзел матэматыкі, які вывучае геаметрычныя аб'екты, звязаныя алг. ўраўненнямі, — алг. мнагастайнасці. Узнікла ў 17 ст. з увядзеннем у геаметрыю паняцця *каардынат*. У сярэдзіне 19 ст. А.г. выдзелілася з матэм. аналізу як тэорыя алг. крывых. У канцы 19 ст. італьян. вучоныя К.Сегрэ, Л.Крэмона і інш. стварылі тэорыю алг. паверхняў. У 1930-я г. матэматыкі галандскі Б.Л.Ван-дэр-Вардэн, ням. Г.Гасе і франц. А.Вейль стварылі асновы А.г. над адвольным полем К.Падабенства тэорыі алг. крывых і тэорыі алг. лікаў стымулявала пошукі агульнай алг. асновы (амер. вучоны О.Зарыскі, франц. матэматыкі К.Шэвале і Ж.Сер). Асновай стала тэорыя схем (франц. матэматык А.Гратэндзік), дзе, напр., на геам. мове разглядаліся сістэмы алг. ураўненняў над адвольным камутатыўным кольцам, апісваліся ўласцівасці праектыўных мнагастайнасцяў. А.г. звязана з тэорыяй функцый камплексных пераменных, лікаў тэорыяй, ураўненнямі матэматычнай фізікі і інш.

*Літ.:* Шафаревич И.Р. Основы алгебраической геометрии. 2 изд. Т. 1—2. М., 1988; Гриффитс Ф., Харрис Дж. Принципы алгебраической геометрии: Пер. с англ. Т. 1—2. М., 1982. *В.А.Ліпніцкі.*

**АЛГЕБРАІ́ЧНАЯ ТАПАЛО́ГІЯ**, галіна *тапалогіі*, якая вывучае ўласцівасці аб'ектаў і іх узаемных адлюстраванняў, што не мяняюцца пры неперарыўных дэфармацыях (гаматопіях). З кожнай тапалагічнай прасторай звязваецца паслядоўнасць алг. аб'ектаў $H_n(x)$ (груп гамалогій); кожнаму неперарыўнаму адлюстраванню f:X → Y тапалагічных прастораў адпавядае набор гамамарфізмаў $f_n$:$H_n(X)$ → $H_n(Y)$. Пры гэтым тапалагічная задача пераўтвараецца ў адпаведную алг. задачу. Калі сродкі алгебры дазваляюць рашыць такую задачу, то адваротным шляхам атрымліваюцца пэўныя меркаванні аб зыходнай тапалагічнай праблеме. У А.т. звычайна

разглядаюцца складаныя алг. аб'екты, напр., комплексы (мнагагранікі, паліэдры), мнагастайнасці (замкнёныя, адкрытыя, гладкія, аналітычныя і інш.). *В.А.Ліпніцкі.*

**АЛГЕБРАІ́ЧНАЯ ФУ́НКЦЫЯ**, функцыя, звязаная *алгебраічным ураўненнем* з незалежнай пераменнай; важнейшая функцыя матэматыкі. А.ф. f(x) наз. абмежаванай зверху (знізу) на мностве E, калі існуе лік M, што для кожнага x з мноства E выконваецца няроўнасць f(x)<M[f(x)>M], напр., функцыя $x^2$ абмежаваная на адрэзку $0\le x\le 1$. Рацыянальная А.ф. атрымліваецца ў выніку канечнага ліку арыфм. аперацый (складання, аднімання, множання і дзялення) над пераменнымі і лікамі, напр., $z=5x^2+3xy-2y^2$, $y=\frac{1+x+x^2}{2+x^3}$; астатнія А.ф. — і р а ц ы я н а л ь н ы я, якія звычайна неадназначныя, напр., $z=\frac{x-y}{\sqrt{x^2+y^2}}$, $y=\sqrt{1+x^2}$. Агульная тэорыя А.ф. звязана з тэорыяй аналітычных функцый, алгебрай і алгебраічнай геаметрыяй.

**АЛГЕБРАІ́ЧНЫ ВЫ́РАЗ**, матэматычны выраз, які складаецца з літар і лікаў, злучаных знакамі алг. дзеянняў: *складання, аднімання, множання, дзялення, узвядзення ў ступень, здабывання кораня.* Р а ц ы я н а л ь н ы А.в. адносна некаторых літар не змяшчае іх пад знакам кораня. І р а ц ы я н а л ь н ы А.в. мае радыкалы, напр., $\sqrt{x+y}$. Ц э л ы А.в. адносна некаторых літар не змяшчае дзялення на выразы з гэтымі літарамі. Калі некаторыя з літар (або ўсе) лічыць пераменнымі, то такі А.в. наз. *алгебраічнай функцыяй.*

**АЛГЕБРАІ́ЧНЫ ЛІК**, корань мнагасклад $P(x)=a_nx^n+...+a_1x+a_0$ з рацыянальнымі каэфіцыентамі $a_n$, з якіх не ўсе роўныя 0; у агульным выпадку можа быць *камплексным лікам.* Г.*Кантар* (1872) паказаў, што мноства ўсіх А.л. злічонае і таму існуюць неалг. лікі (гл. *Трансцэндэнтны лік*), напр., $\sqrt{2}$, $\pi$ і інш. Мноства ўсіх А.л. — алгебраічна замкнёнае поле (напр., адвольны корань мнагасклада з алг. каэфіцыентамі таксама А.л.). *В.І. Бернік.*

**А́ЛГЕБРЫ АСНО́ЎНАЯ ТЭАРЭ́МА**, класічная тэарэма існавання, якая сцвярджае, што кожны мнагасклад з камплекснымі каэфіцыентамі мае камплексны корань. Упершыню выказаў ням. матэматык П.Ротэ (1608), першым дакладна даказаў К.Гаўс (1799). Усе доказы абапіраюцца на тапалагічныя ўласцівасці мностваў камплексных і рэчаісных лікаў. З А.а.т. вынікае: колькасць каранёў мнагаскладу супадае са ступенню мнагаскладу; кожны паліном з рэчаіснымі каэфіцыентамі раскладаецца ў здабытак лінейных і квадратычных множнікаў з рэчаіснымі каэфіцыентамі. *В.А.Ліпніцкі.*

**АЛГО́ЛЬ**, β Персея, зацьменная пераменная зорка (пераменнасць адкрыта ў 1669). Бляск 2,2—3,5 візуальнай *зорнай велічыні* з перыядам 2,867 сут. Адлегласць ад Сонца — 36 пк. Пераменныя зоркі з крывой змянення бляску, як у А., складаюць клас зорак тыпу Алголя.

**АЛГО́НКІН** (Algonquin), правінцыяльны парк у Канадзе, на правабярэжжы р. Атава, правінцыя Антарыо. Засн. ў 1893. Пл. 765,3 тыс. га. Размешчаны на невысокім узвышшы — Лаўрэнційскім крышталічным шчыце. Захоўваюцца ландшафты драбналістых і мяшаных лясоў з азёрамі і балотамі. Сярод прадстаўнікоў 15 асн. парод раслін некалькі відаў клёнаў, веймутава сасна, тсуга канадская, асінападобная таполя, вяз, ясень, жоўтая бяроза, шызая елка і інш. У фауне воўк, бабёр, чорны мядзведзь, лось, белахвосты (віргінскі) алень; з птушак звычайныя лысуха, каўнерыкавы рабчык, аўсянка-юнка, белабрывая аўсянка, некалькі відаў амер. валасянак і інш. Развіты турызм, працуюць інфармацыйны цэнтр і музей.

**АЛДА́Н**, рака ў Рэспубліцы Саха (Якуція), правы прыток Лены. Даўж. 2273 км, пл. бас. 729 тыс. км$^2$. Пачынаецца на паўн. схіле Станавога хрыбта, цячэ па Алданскім нагор'і, уздоўж паўд. падножжа Верхаянскага хрыбта, упадае за 160 км ніжэй Якуцка. Даліна ў межах Алданскага нагор'я складаецца з шырокіх і вузкіх каньёнападобных участкаў з перакатамі і шыверамі; у сярэднім цячэнні шырокая, з тэрасаванымі схіламі. Асн. прытокі: Тымптон, Учур, Мая, Алах-Юнь (справа), Амга (злева). Разводдзе з мая да ліп., у жн.—вер. паводкі. Ледастаў з кастр. да мая. Сярэдні гадавы расход вады ў ніжнім цячэнні 5150 м$^3$/с. У бас. А. больш за 51 тыс. азёр. Рыбалоўства (асетр, сцерлядзь, харыус). Суднаходны на 1753 км ад вусця. Гал. прыстані: Тамот, Усць-Мая, Хандыга. У бас. А. радовішчы жал. руды, каменнага вугалю, золата, слюды-флагапіту.

**АЛДА́НАЎ** Марк Аляксандравіч (сапр. прозвішча Л а н д а ў ; 7.11.1886, Кіеў— 25.2.1957), рускі пісьменнік. Скончыў Кіеўскі ун-т (1910). З 1919 у эміграцыі. Аўтар гіст. тэтралогіі «Мысліцель» (1921—27), прысвечанай пераломным падзеям у Францыі і Расіі ў эпоху Вял. франц. рэвалюцыі (раманы «Дзевятае тэрмідора», «Чортаў мост», «Змова», аповесць «Святая Алена, маленькі востраў»). Своеасаблівым поглядам «з эміграцыі» на падзеі рас. рэвалюцыі і трагічны раскол рас. грамадства сталі яго трылогія «Ключ», «Уцёкі», «Пячора» (1929—36), раманы «Вытокі» (1950) і «Самазабойства» (1956), у якіх эрудыцыя гіст.-філас. даследавання спалучаецца з вастрынёй прыгодніцкага сюжэта. Аўтар кніг гіст. нарысаў «Агонь і дым» (1922), «Сучаснікі» (1928), «Партрэты» (1931 і 1936) і інш. У сав. час творы А. былі забаронены (пачалі друкавацца ў 1989).

*Тв.:* Собр. соч. Т. 1—6. М., 1991.

**АЛДА́НСКАЕ НАГО́Р'Е**, ва Усх. Сібіры, у міжрэччы Алёкмы і Учура, у Рэспубліцы Саха (Якуція). Пераважаюць плоскія міжрэчныя шырокія катлавіны (выш. да 1000 м), над якімі ўзнімаюцца хрыбты Зах. Янгі, Сунагын, Кет-Кап (выш. 2306 м). Складзена з моцна змятых дакембрыйскіх гнейсаў і крышт. сланцаў, перарваных інтрузіямі гранітаў і ультраасноўных парод, перакрытых вапнякамі і пясчанікамі. Ра-



М.А.Алданаў.

довішчы жал. і медных рудаў, вугалю (Паўд.-Якуцкі басейн), золата, слюды. На схілах да выш. 110—1300 м тайга з даурскай лістоўніцы, вышэй — камяністая тундра.

**АЛДА́НСКІ ШЧЫТ**, выступ дакембрыйскага крышт. фундамента на ПдУ *Сібірскай платформы.* У асноўным супадае з Алданскім нагор'ем і Станавым хрыбтом. Прадстаўлены шэрагам буйных блокаў, размежаваных мерыдыянальнымі разломамі. На Пд і З шчыта глыбінныя разломы, на Пн — сістэма *флексур.* Дакембрыйскія ўтварэнні фундамента складаюць некалькі структурных паверхаў ранніх стадый развіцця зямной кары. Самы стараж. паверх (больш за 3,5 млрд. г.) мае гранулітавую гнейса-гранітную, мармуровую, сланцавую, кварцытавую аснову. Сярэдні (3,5—2,7 млрд. г.) складзены з метамарфізаваных асадкава-вулканагенных адкладаў. Верхні паверх (2,7—1,5 млрд. г.) — абломкавыя вулканагенныя ўтварэнні і буйныя інтрузіі. На З А.ш. перакрыты магутным (больш за 10 км) платформавым чахлом. У крышт. структурах А.ш. радовішчы рудаў жалеза, медзі, слюдаў, рэдкіх металаў, золата, п'езакварцу; ва ўпадзінах, запоўненых кантынентальнымі асадкамі, радовішчы каменнага вугалю. *А.М.Баско.*

**А́ЛЕ** (Alle) Аўгуст (31.8.1890, г. Вільяндзі, Эстонія — 8.7.1952), эстонскі пісьменнік. Скончыў Тартускі ун-т (1937). Друкаваўся з 1911. Дэбютаваў рамант.-сімвалісцкімі вершамі з міфалаг. матывамі (зб. «На астравах адзіноты», 1918; «Ліловы слон», 1923). Развіваў жанр сатыр. эпіграмы, востра антыфаш. ў гады Айч. вайны. Аўтар зб. вершаў «Carmina barbata» (1921), «Мутныя хвалі» (1930), «Суровыя рытмы» (1934), «Эпіграмы» (1944) і інш. У 1946—52 рэдактар час. «Looming» («Творчасць»). Паасобныя вершы А. перакладзены на бел. мову.

*Тв.:* Сатира и лирика. Таллинн, 1960.
*Н.Басель.*

**АЛЕАГРА́ФІЯ** (ад лац. oleum алей + ...*графія*), спосаб рэпрадуктавання твораў алейнага жывапісу, пашыраны ў 2-й пал. 19 ст. З'яўлялася рамесніцкай каляровай *літаграфіяй* на камянях (да 20 ст., у залежнасці ад колькасці фарбаў). Каб атрымаць больш поўнае падабенства, на гатовы адбітак наносяць лак і робяць на ім ціснення, якое імітуе фактуру палатна.

**АЛЕА́НДР** (Nerium), род раслін сям. кутравых. 3 віды ў Міжземнамор'і і субтропіках Азіі. А. звычайны (N. oleander) вырошчваюць на Пд Крыма, на Чарнаморскім узбярэжжы Каўказа, у Закаўказзі, Сярэдняй Азіі; на Беларусі — як пакаёвую расліну.

Вечназялёныя кусты выш. 2—6 м. Лісце вузкае, ланцэтападобнае, супраціўнае. Кветкі яркія, простыя або махровыя, буйныя, духмяныя, у шчыткападобных суквеццях. Венчык чырвоны, ружовы, белы ці жоўты. Плады — шматнасенныя лістоўкі. Размнажаюцца чаранкамі і насеннем. Дэкар. віды. Атрутныя. Прэпараты з лісця А. звычайнага выкарыстоўваюцца пры парушэннях сардэчна-сасудзістай дзейнасці.

**АЛЕА́РЫЙ** [Olearius; сапр. Эльшлегер (Ölschläger)] Адам (16.8.1603, Саксонія — 23.2.1671), нямецкі вучоны, падарожнік. Вучыўся, потым выкладаў у Лейпцыгскім ун-це. Прыдворны матэматык і бібліятэкар у герцага Фрыдрыха III Шлезвіг-Гальштэйнскага. Ведаў рус. і араб. мовы. Наведаў Расію ў складзе пасольства герцага ў 1633—34. Аўтар «Апісання падарожжа ў Масковію...» (выд. 1647, рус. пер. 1906) са звесткамі па геаграфіі, гісторыі Расіі, яе населеных пунктах, народах і іх звычаях; мае шмат картаў і малюнкаў. У 1654 выдаў на ням. мове зб-кі перс. і араб. паэтаў.

**АЛЕАТО́РЫКА** (ад лац. alea ігральныя косці; выпадковасць), метад муз. кампазіцыі, які прадугледжвае мабільнасць (незамацаванасць) муз. тканіны ці формы. Узнікла ў 1950-я г., найб. характэрная для прадстаўнікоў *авангардызму* (Дж.Кейджу, К.Штокгаўзену і інш.). Заснавана на прынцыпе выпадковасці і імправізацыйнасці ў будове муз. твора. Адрозніваюць абсалютную А. (ахопліваe муз. твор у цэлым) і адносную (увядзенне фрагмента А. ў інш. акружэнне; больш пашырана). Як сродак драматургічнага кантрасту, муз. вобразнасці і экспрэсіі А. сустракаецца ў творах А.Шнітке,Р.Шчадрына,Э.Дзянісава, Ф.Сланімскага, у бел. кампазітараў С.Картэса, Дз.Смольскага, В.Войціка, А.Мдывані, В.Капыцько і інш. Графічны запіс алеаторных твораў (побач з агульнапрынятай натацыяй ужываюцца спец. знакі) пакідае шмат момантаў на меркаванне музыканта, у выніку выканальніцкія версіі істотна адрозніваюцца паміж сабой.

*Літ.:* Денисов Э. Современная музыка и проблемы эволюции композиторской техники. М., 1986. С. 112—136. *Т.Г.Мдывані.*

**АЛЕБА́РДА** (франц. hallebarde), старадаўняя халодная колюча-рубячая зброя, доўгае (да 2,5 м) плоскае або гранёнае кап'ё з прымацаванай да яго сякерай або паўмесяцападобным лязом. У 14—16 ст. была на ўзбраенні пяхоты некаторых дзяржаў Зах. Еўропы; на Беларусі выкарыстоўвалася ў 15—18 ст.; да канца 19 ст. — зброя парадных падраздзяленняў, а таксама палацавай і гарадской варты. Гл. таксама *Бярдыш.*

**АЛЕБА́СТР** (грэч. alabastros), 1) мінерал, тонказярністая масіўная разнавіднасць *гіпсу.* 2) Адна з назваў буд. гіпсу. Атрымліваюць абпальваннем (120 — 170 °С) прыроднага гіпсу да ператварэння яго ў паўгідрат сульфату кальцыю.

**АЛЕВІ́З ФРА́ЗІН**, Алевіз Міланец (Aloisio da Milano), італьянскі

Кветка алеандра.

архітэктар канца 15 — пач. 16 ст. У 1494 быў запрошаны да Івана III у Маскву. Удзельнічаў у буд-ве сцен Крамля ўздоўж р. Няглінная (1495), каменных палат у Крамлі (1499—1508, пазней увайшлі ў склад Церамнога палаца), рова ўздоўж сцен Крамля з боку Краснай пл. (1508—16, засыпаны ў 19 ст.), плаціны на р. Няглінная (1508).

**АЛЕВІ́З ФРА́ЗІН**, Алевіз (Aloisio) Новы, італьянскі архітэктар канца 15 — пач. 16 ст. У 1503—04 пабудаваў у Бахчысараі палац хана Менглі-Гірэя (захаваўся разны мураваны партал). З 1504 па запрашэнні Івана III у Маскве, дзе, паводле летапісу, пабудаваў 11 цэркваў (не захаваліся) і Архангельскі сабор у Крамлі (1505—08), у дэкар.

Алебарда.

апрацоўцы якога выкарыстаў элементы архітэктуры італьян. Адраджэння.

**АЛЕ́Г** (?—912, паводле інш. крыніц 922), старажытнарускі князь. Паводле *«Аповесці мінулых гадоў»*, як сваяк *Рурыка* (паводле інш. крыніц, А. — ваявода Рурыка) стаў пасля яго смерці (879) рэгентам пры малалетнім кн. *Ігару*, княжыў у Ноўгарадзе. Рэгенцтва А. — гіст. міф, бо да пач. самаст. княжання Ігару было не менш як 33 гады. У 882 А. рушыў з дружынай на Пд. Заняў Смаленск. Забіўшы кіеўскіх князёў *Аскольда* і *Дзіра*, авалодаў Кіевам і зрабіў яго сталіцай. Пашырыў уладанні Русі на У, падпарадкаваўшы *севяран* і *радзімічаў*; здзейсніў 2 паспяховыя паходы на Канстанцінопаль (907 і 911). Адзін з найб. яркіх маст. вобразаў А. створаны А.С.Пушкіным у паэме «Песня пра вешчага Алега» (1822).

**АЛЕ́Г СВЯТАСЛА́ВІЧ** (сярэдзіна 11 ст. — 1.8.1115), князь уладзіміра-валынскі [1073—76], тмутараканскі [1083—94], чарнігаўскі [1094—96], ноўгарад-северскі [1097—1115]. Сын *Святаслава Яраславіча.* У 1076 разам з *Уладзімірам Манамахам* здзейсніў паход у Чэхію. У 1078, пасля няўдалай спробы замацавацца ў Чарнігаве, уцёк у Тмутаракань. Трапіў у палон да хазараў (1079), 4 гады прабыў у Канстанцінопалі і на в-ве Родас. У 1094 заняў Чарнігаў, але вымушаны быў аддаць яго брату Давыду (1096). Паводле рашэння *Любецкага з'езда 1097* атрымаў ва ўдзел Ноўгарад-Северскі. Удзельнічаў у Віцячоўскім 1100 і Залотчаўскім 1101 княжацкіх з'ездах, у паходах на полаўцаў (1107 і 1113).

**АЛЕ́ГІЯ**, малая планета № 3501. Сярэдні дыяметр 17 км, пл. каля 90 км$^2$, сярэдняя адлегласць ад Сонца прыблізна 3 а.а., перыяд абарачэння 5 гадоў. Адкрытая ў 1971 у Крымскай астрафіз. абсерваторыі. Наз. ў гонар астранома Алега *Коратцава.*

**АЛЕГО́РЫЯ** (ад грэч. allēgoria іншаказанне), 1) адлюстраванне адцягненай ідэі (паняцця) пры дапамозе канкрэтнага нагляднага вобраза. Узнікненне А. звязана з практыкай вытлумачэння стараж. шанавальных тэкстаў (у эпоху элінізму — Гамера, у хрысц. багасловаў — Біблії); у сярэднявеччы алегарычна вытлумачваўся і свет прыроды як павучальны наглядны дапаможнік, створаны Богам для чалавека. Паняцце «А.» ўпершыню сустракаецца ў трактатах Псеўда-Лангіна, Цыцэрона, у эстэт. вучэннях Гарацыя, Плутарха, Лукрэцыя Кара і інш. Іншаказальны прынцып А. пашыраны ў сярэдневяковай эстэтыцы, у мастацтве Адраджэння і Асветніцтва. Існуе як прыём і прынцып арганізацыі маст. матэрыялу ў фальклоры, у розных відах выяўл. мастацтва. 2) У выяўленчым мастацтве А. ствараецца пры дапамозе вобраза канкрэтнай, асацыятыўна блізкай істоты, прадмета або з'явы (напр., правасуддзе — жанчына з завязанымі вачыма і з

шалямі ў руках). А. шырока выкарыстоўвалася ў мастацтве Адраджэння (А. граматыкі ў кн. «Грамматіка словенска...» Л.Зізанія, 1596), маньерызму, барока, ракако, класіцызму, рамантызму. Найб. пашыраны від А. — персаніфікацыя, г. зн. фігура, аздобленая пэўнымі атрыбутамі, якія тлумачаць яе змест. А. сустракаецца ў мастацтве 19—20 ст. — у манум. скульптуры, творах жывапісу, плакаце, паліт. карыкатуры і інш.

**АЛЕ́ЗІЯ** (Alesia), старажытнае гальскае паселішча-опідум (сучасны г. Аліз-Сент-Рэн, Францыя), аблогай і ўзяццем якога Юлій Цэзар у 52 да н.э. скончыў шматгадовую гальскую вайну. Займала пл. 57 га, была абкружана сцяной і ровам. А. абараняла 20-тыс. войска галаў на чале з Верцынгетарыгам. Раскопкамі выяўлены рэшткі тысяч гальскіх воінаў (са зброяй і інш. рэчамі), якія па загадзе Цэзара былі скінуты ў выкапаны рымлянамі аблогавы роў даўжынёй 13 км; гальскія і правінцыяльна-рымскія дамы (пасля вайны жыццё ў А. працягвалася), храмы, арэна.

**АЛЕ́І**, тлушчы, атрыманыя з пладоў і насення розных раслін. Складаюцца на 95—97% з сумесі трыгліцэрыдаў (поўных эфіраў гліцэрыны) вышэйшых насычаных і ненасычаных тлустых кіслот, пераважна $C_{16}$ і $C_{18}$, і свабодных тлустых кіслот, фасфатыдаў, воску, токаферолаў, вітамінаў, пігментаў і інш. Не маюць у сабе халестэрыну. У залежнасці ад саставу тлустых кіслот падзяляюцца на высыхальныя (*ільняны алей, канапляны алей, тунгавы алей*), паўвысыхальныя (соевы і макавы А.) і невысыхальныя (*какосавы алей, пальмавы алей*).

А. — вадкія, мазепадобныя ці цвёрдыя афарбаваныя рэчывы, некаторыя з іх таксічныя. Палімерызуюцца пры t 250—300 °С ці пад уздзеяннем кіслароду паветра (паглынаюць да 30%, чым тлумачыцца «прагарканне» А.). Атрымліваюць са здробненага насення, мякаці пладоў алейных раслін, у т.л. *алейных культур*, прасаваннем ці экстрагаваннем арган. растваральнікамі з ачысткай, адстойваннем, фільтрацыяй, апрацоўкай вадой (гідратацыя), растворамі шчолачаў (рафінацыя), адсарбентамі ці глінамі (адбельванне), вадзяной парай пад вакуумам (дэзадарацыя). Падзяляюцца на сырыя, рафінаваныя і нерафінаваныя. Выкарыстоўваюцца як харч. прадукты, для прыгатавання кансерваў, маянэзаў, гідрыраваныя А. — для маргарынаў; у выт-сці мыла, гліцэрыны, тлустых кіслот, алкідных смолаў, пакостаў, алейных лакаў і фарбаў, сікатыву; як вяжучае мед. мазяў, касметычных сродкаў.

**АЛЕ́ІНАВАЯ КІСЛАТА́**, аднаасноўная ненасычаная карбонавая кіслата, $CH_3(CH_2)_7CH = CH(CH_2)_7COOH$. Мал. м. 282. Бясколерная вязкая вадкасць, $t_{кіп}$ 232 °С (15 мм рт. сл.), шчыльн. $0{,}89 \cdot 10^3$ кг/м$^3$, нерастваральная ў вадзе, раствараецца ў арган. растваральніках. Уваходзіць у састаў алеяў і жывёльных тлушчаў, у аліўкавым алеі 70—85%. Эфіры А.к. выкарыстоўваюцца ў выт-сці алейных фарбаў, касметычных прэпаратаў, флатарэагентаў, пластыфікатараў, тэкстыльна-дапаможных рэчываў. Этылавы эфір А.к. (лінетол) — лек. сродак для зніжэння халестэрыну. Здольная выклікаць экзэму.

**АЛЕЙЖАДЫ́НЬЮ** (Aleijadinho, літар. маленькі калека; сапр. Л і с б о а Антоніу Франсіску, Lisbôa; 29.8.1730 або 1738, г. Віла-Рыка, Бразілія — 18.11.1814), бразільскі скульптар і архітэктар; прадстаўнік позняга барока. Знявечаны праказай, працаваў, прымацоўваючы інструменты да пальчатак. Пабудаваў цэрквы Сан-Франсіску ў Ору-Прэту і ў Сан-Жуан-дэл-Рэй. Стварыў скульптуры 12 біблейскіх прарокаў і серыю драўляных паліхромных груп «Страсці Хрыстовы» ў царкве Бон-Жэзус-ды-Матазіньюс у Канганьясе.

**АЛЕЙКІ́Я**, гл. *Агранулацытоз.*

**АЛЕЙКСА́НДРЭ** (Aleixandre) Вісентэ (26.4.1898, Севілья, Іспанія — 14.12.1984), іспанскі паэт. Творы 1920—30-х г. напісаны пад уплывам сюррэалізму і фрэйдызму: зб-кі «Акруга» (1928), «Шпагі нібы губы» (1932), «Разбурэнне ці любоў» (1933), кн. вершаў у прозе «Страсць зямлі» (1935). У час нац.-рэв. вайны ў Іспаніі (1936—39) пісаў антыфаш. вершы. Зб. «Цені раю» (1944) — паэтычная утопія пра царства шчасця і прыгажосці, якое бачыць чалавек на парозе смерці. Аўтар філас. лірыкі (зб. «Апошняе нараджэнне», 1953; «Гісторыя сэрца», 1954; «Унутраныя дыялогі», 1974 і інш.), кн. мемуараў «Сустрэчы» (1958). Нобелеўская прэмія 1977.

Да арт. **Алегорыя.** С.Б а т ы ч э л і. Вясна. Фрагмент (Тры грацыі). Каля 1477—78.

*Тв.:* Mis poemas mejores. Madrid, 1968.

**АЛЕ́ЙНАЕ ДРЭ́ВА**, гл. *Тунг.*

**АЛЕ́ЙНА-ТЛУ́ШЧАВАЯ ПРАМЫСЛО́ВАСЦЬ**, галіна *харчовай прамысловасці*, вытв-сць раслінных алеяў, маргарыну, маянэзу, кулінарнага тлушчу, пакосту, гліцэрыну, гасп. мыла, мыйных сродкаў на тлушчавай аснове, а таксама гідрагенізацыя і расшчапленне тлушчу.

У старажытнасці выраблялі аліўкавы і пальмавы алей, які лёгка выдзяляецца пры

В.Алейксандрэ.

невял. ціску. У пач. 19 ст. пашырыўся прэсавы метад, у 1856 вынайдзены больш эфектыўны экстракцыйны метад з выкарыстаннем арган. растваральнікаў алею (бензіну, дыхлорэтану). Выраблялі соевы, пальмавы (з пладоў алейнай і какосавай пальмаў), сланечнікавы, рапсавы, бавоўнікавы, ільняны, гарчычны, кукурузны, арахісавы, аліўкавы, тунгавы, рыцынавы, абляпіхавы і інш. алей (гл. *Алейныя культуры*). Сусветны выраб за год больш за 90 млн. т (1986), больш як палова яго — харчовы. Найбуйнейшыя вытворцы: ЗША, Бразілія, Мексіка (соевы алей); Кітай, Індыя, Германія, Канада (рапсавы); Аргенціна, Расія, Германія, Украіна (сланечнікавы); Іспанія, Італія, Партугалія (аліўкавы); Малайзія, Інданезія, Нігерыя, Калумбія (пальмавы).

Вытворчасць алею на Беларусі вядома з ранняга сярэднявечча. Выціскалі з насення лёну і канопляў. Галіна А.-т. п. ўзнікла ў сярэдзіне 19 ст. спачатку на мясц. сыравіне, потым — на прывазной. У 1913 дзейнічала 6 цэнзавых алейных, 5 мылаварных і 2 стэарынавыя з-ды. У 1931 пабудаваны маслабойны завод у Віцебску, у 1932 — маргарынавы ў Гомелі (з 1935 — тлушчавы камбінат), у 1939 дзейнічалі Баранавіцкі і Глыбоцкі маслабойныя з-ды; у 1940 наладжаны выраб пакосту (Віцебск). Пасля Вял. Айч. вайны аднавілі работу Бабруйскі і Баранавіцкі маслабойныя з-ды, Гомельскі тлушчавы камбінат. У 1951 пабудаваны *Мінскі маргарынавы завод*. Рэканструяваны Бабруйскі маслабойны з-д. На Віцебскім маслабойным з-дзе пушчаны экстракцыйны цэх. У 1991 уведзены ў строй маслабойны цэх у калгасе «Новы быт» (Мінскі р-н). Працуюць (1995): Віцебскі алейнаэкстракцыйны завод, *Гомельскі тлушчавы камбінат*, Мінскі маргарынавы завод, Бабруйскі алейны з-д, алейны цэх у калгасе «Новы быт». Выраб алею ў 1994 склаў 5,2 тыс. т (найб. аб'ём выт-сці ў 1990 — 26,4 тыс. т), маргарынавай прадукцыі 19,2 тыс. т (найб. аб'ём у 1987—127,7 тыс. т). Адходы А.-т.в. ідуць на

корм жывёле (гл. *Макуха, Шрот*). Алей для спажывання і далейшай перапрацоўкі завозіцца на Беларусь з Украіны, Малдовы, Расіі, Германіі, Польшчы (129,2 тыс.т, 1990; 44,3 тыс. т, 1994); сыравіна для А.-т.п. — з Польшчы і Германіі. *Т.Н.Жданоўская, Г.П.Астапенка.*

**АЛЕ́ЙНІК** Барыс Ілыч (н. 22.10.1935, с.

Б.І.Алейнік.

П.М.Алейнікаў.

Зачапілаўка Новасанжарскага р-на Палтаўскай вобл.), украінскі паэт. Акад. АН Украіны (з 1990). Скончыў Кіеўскі ун-т (1958). Паэтызуе стваральную працу, прыгажосць прыроды, гераіку сучаснасці і гіст. мінулага Украіны. Аўтар зб-каў паэзіі «Сталь загартоўваюць кавалі» (1962), «Кола» (1968), «На лініі цішыні» (1972), «Ісціна» (1976), «Мера» (1984), кн. літ.-крытычных артыкулаў «Планета паэзіі» (1983), публіцыст. кн. «Князь цемры: Два гады ў Крамлі» (1993) і інш. За зб. «Стаю на зямлі» (1973) Дзярж. прэмія СССР 1975, за зб-кі «Сівая ластаўка» (1979), «У люстры слова» (1981), «Дума аб горадзе» (1982) Дзярж. прэмія Украіны імя Т.Шаўчэнкі 1983, за публіцыст. творы і цыкл вершаў «Скаварада і свет» (1994) Міжнар. прэмія імя Г.Скаварады 1994. Перакладаў на ўкр. мову творы Г.Бураўкіна, Н.Гілевіча, А.Куляшова. Кнігу выбр. вершаў і паэм А. на бел. мову пераклаў Бураўкін.

*Тв.:* Вибр. твори. Т. 1—2. Київ, 1985; Бел. пер. — Заклінанне агню. Мн., 1979.
*В.А.Чабаненка.*

**АЛЕ́ЙНІК** Дзмітрый Іванавіч (н. 11.5.1929, г. Беразіно), бел. жывапісец. Засл. дз. маст. Беларусі (1981). Скончыў Мінскае маст. вучылішча (1954), Бел. тэатр.-маст. ін-т (1960, вучыўся ў В.Волкава, У.Сухаверхава, В.Цвіркі). Працуе ў галіне станковага і манум. жывапісу. Аўтар тэматычных карцін, пейзажаў: «Вясна. Порт» (1963), «Вечная памяць» (1965), «Лясное возера» (1969), «Белыя коні» (1972), «Асеннія далячыні» (1978), «Дзявочы гай» (1979); мазаічных пано «Карагод» (1968) і «Каруначніцы» (1974, абодва з М.Казакевічам) і інш. *Т.А.Карповіч.*

**АЛЕ́ЙНІК** Сцяпан Іванавіч (3.4.1908, с. Пасыцэлы Балцкага р-на Адэскай вобл. — 11.1.1982), украінскі паэт-гумарыст і сатырык. Скончыў Адэскі пед. ін-т (1934). Друкаваўся з 1926. Аўтар кн. вершаў «Нашы знаёмыя» (1948, Дзярж. прэмія СССР 1950), зб-каў гумарыст. вершаў і фельетонаў «Ходзіць Перац па агародзе» (1952), «Які Сава — такая і слава» (1955), «Здаравенькі былі!» (1958), «П'яныя ваўкі» (1962), «Дазасядаўся!..» (1968) і інш., біягр. апавяданняў («З кнігі жыцця», 1964), успамінаў пра дзеячаў л-ры і мастацтва. Пераклаў на ўкр. мову творы У.Корбана (у зб. «Тона попелу», 1964).

*Тв.:* Твори. Т. 1—4. Київ, 1978; Бел. пер. — Гумар і сатыра. Мн., 1959; Цуд у чаравіку. Мн., 1970. *В.А.Чабаненка.*

**АЛЕ́ЙНІК** Уладзімір Пятровіч (н. 12.9.1959, г. Смалявічы), бел. спартсмен (скачкі ў ваду з вышкі). Сярэбраны (1980, Масква) і бронзавы (1976, Манрэаль) прызёр Алімпійскіх гульняў, чэмпіён Еўропы (1977), СССР (1976,



Дз.Алейнік. Вясна. Порт. 1963.

1980). Пераможца і прызёр міжнар. і ўсесаюзных спаборніцтваў.

**АЛЕ́ЙНІКАЎ** Павел Раманавіч (снеж. 1917, в. Таль Любанскага р-на Мінскай вобл. — 18.2.1945), Герой Сав. Саюза (1940). Удзельнік сав.-фінл. вайны 1939—40. Малодшы камандзір А. вызначыўся ў лютым 1940 у баях у раёне пас. Краснасельскае Выбаргскага р-на. У Вял. Айч. вайну на Паўд. і 3-м Бел. франтах. Загінуў у баі.

**АЛЕ́ЙНІКАЎ** Пётр Марцінавіч (12.7.1914, в. Крывель Шклоўскага р-на

П.М.Алейнікаў (у цэнтры) у ролі Малібогі (фільм «Сямёра смелых»).

Магілёўскай вобл. — 9.6.1965), рус. кінаакцёр. Скончыў Ін-т сцэн. мастацтваў у Ленінградзе (1935). З 1932 здымаўся ў кіно. Яго героі — абаяльныя маладыя хлопцы, нястомныя гумарысты, адданыя сябры, добрыя і высакародныя: Малібога («Сямёра смелых»), Пётр Алейнікаў («Камсамольск»), Ваня Курскі («Вялікае жыццё»), Саўка («Трактарысты»), танкіст («Беларускія навелы») і інш. Творчаму шляху А. прысвечаны фільм «Пётр Марцінавіч і гады вялікага жыцця».

**АЛЕ́ЙНІКАЎ** Сяргей Пятровіч (4.2.1909, в. Заціпша Магілёўскага р-на — 1.2.1984), Герой Сав. Саюза (1944). Скончыў Маскоўскую школу ВПС (1930). У Вял. Айч. вайну са жн. 1941 на фронце. Штурман авіяцыі далёкага дзеяння маёр А. зрабіў 240 вылетаў на разведку і бамбардзіроўку аб'ектаў праціўніка, удзельнічаў у баях пад Масквой, Сталінградам, Арлом, Ленінградам, на Беларусі, у Германіі. Да 1947 у ВПС.

**АЛЕ́ЙНІКАЎ** Сяргей Яўгенавіч (н. 7.11.1961, Мінск), бел. спартсмен (футбол). Скончыў Бел. ін-т фіз. культуры (1983). З 1981 у складзе мінскага «Дынама». Чэмпіён (1982) і бронзавы прызёр (1983) першынства СССР. Сярэбраны прызёр чэмпіянату Еўропы (1988). З 1989 у італьян. прафес. футбольных клубах «Ювентус» (у складзе яго — уладальнік Кубкаў Італіі і УЕФА, 1990), «Леча», з 1993 у яп. клубе «Гамба». Удзельнік чэмпіянатаў свету (1986, 1990), Еўропы (1988, 1992) у складзе зборных СССР і СНД, правёў за іх (з 1984) 77 гульняў. Выступаў за зборную свету (1990). Аўтар кн. «І жыццё, і слёзы, і футбол...» (1992, разам з Дз.Беленькім).

**АЛЕ́ЙНЫ ЖЫ́ВАПІС**, від жывапісу маст. алейнымі фарбамі, у якіх сувязным рэчывам для каляровых парашкоў (пігментаў) з'яўляюцца алей ільняны, арэхавы, сланечнікавы і інш. і розныя лакі. А.ж. выконваецца пераважна на палатне, дрэве, кардоне, метал. плітах, пакрытых спец. грунтамі (станковы А.ж.) ці па вапнавым тынку (манументальны А.ж.). Вядомы з 10 ст. Пашырыўся на пач. 15 ст. пасля ўдасканалення яго Я. ван *Эйкам*. На Беларусі вядомы з пач. 16 ст. У тэхніцы А.ж. працуе пераважная большасць мастакоў. *П.В.Масленікаў.*

**АЛЕ́ЙНЫЯ КУЛЬТУ́РЫ**, расліны, якія вырошчваюцца для атрымання *алею*. Назапашваюць алей пераважна ў насенні і пладах, некаторыя ў клубеньчыках (чуфа); у вадкім (травяністыя А.к., масліна, тунг) і цвёрдым (пальма, какава, васковае дрэва) стане. Культывуецца каля 50 відаў. У сусв. земляробстве найб. пашыраны соя, арахіс, сланечнік, масліна, рапс, кунжут, клешчавіна. На Беларусі вырошчваюць лён, сланечнік, каноплі (у іх насенні да 40% алею), але

пераважна як *тэхнічныя культуры*. Гл. таксама *Эфіраалейныя культуры*.

**АЛЕ́ЙНЫЯ ЛА́КІ**, растворы прадуктаў сумяшчэння алеяў і прыродных ці сінт. смол у арган. растваральніках. На А.л. выкарыстоўваюць рафінаваныя і часткова запалімерызаваныя алеі, прыродныя (*каніфоль*, бурштын і інш.) і сінтэтычныя (фенола-фармальдэгідныя смолы і іх мадыфікацыі) смолы, растваральнікі (уайт-спірыт, сальвент-нафта, бензін, шкіпінар і інш.), дадаюць *сікатывы*.

У залежнасці ад колькасці алею А.л. падзяляюцца на посныя, сярэднія, тлустыя; атмасферастойлівасць іх павялічваецца з павышэннем тлустасці. А.л. пакрываюць металы, драўнінныя пластыкі, прамочваюць абмоткі электраабсталявання, выкарыстоўваюць у грунтоўках, шпаклёўках і эмалевых фарбах. Замяняюцца алкіднымі лакамі.

**АЛЕ́ЙНЫЯ ФА́РБЫ**, суспензіі неарганічных пігментаў і напаўняльнікаў у *пакостах*. Пігменты — двухаксід тытану, вохра, жалезны сурык, аксід хрому і інш.; напаўняльнікі — тальк, каалін, слюда і інш. Для хуткага высыхання ў А.ф. дадаюць *сікатывы*, для лепшага дыспергавання — *паверхнева-актыўныя рэчывы*. Выпускаюцца густацёртыя (пастападобныя) і гатовыя для выкарыстання (вадкія). Пры высыханні, абумоўленым акісляльнай палімерызацыяй раслінных алеяў пакосту, утвараецца плёнка (атмасферастойлівая, з невысокай цвёрдасцю, набракальная ў вадзе, разбуральная ў шчолачах). Выкарыстоўваюцца ў буд-ве, *алейным жывапісе*.

**АЛЕЙРАДЗІ́ДЫ**, белакрылкі (Aleurodoidea), падатрад насякомых атр. раўнакрылых. Налічваецца больш за 200 відаў, большасць — у тропіках. На Беларусі пашыраны А. цяплічная (Trialeurodes vaporariorum), А. сунічная (Aleurodes fragariae), А. кляновая (Aleurochiton complanatus), А. падтыннікавая (Aleurodes proletella); шкодзяць раслінам.

Даўж. 1—3 мм. Жоўтыя, чырванаватыя, часта з цёмнымі плямамі. 2 пары крылаў, укрытых белым налётам (адсюль другая назва), складваюцца страхападобна. Знаходзяцца на ніжняй паверхні ліста. Яйцы прымацоўваюць да субстрату на сцяблінках. Жывяцца сокам раслін. Дарослыя пералятаюць на невял. адлегласць, рассяляюцца ветрам, лічынкі пераносяцца з пасадачным матэрыялам.

**АЛЕЙРО́НАВЫЯ ЗЯРНЯ́ТЫ** (ад грэч. aleuron мука), пратэінавыя зярняты, бясколерныя невял. круглаватыя адкладанні запасных бялкоў у клетках тканак раслін, пераважна ў насенні. Пажыўнымі рэчывамі А.з. жывіцца зародак пры прарастанні насення. Утвараюцца пры выспяванні насення з высыхаючых вакуолей. Адрозніваюць А.з. простыя (дробныя зярняткі аднароднай структуры) і складаныя, у якіх знаходзяцца бялковыя крышталі і мінер. ўключэнні — глабоіды. Простыя А.з. ёсць у клетках мучністых (пшаніцы, жыта, кукурузы і інш.), складаныя — у алеістым насенні (клешавіны, тунгу, крыжакветных і інш.) раслін.

**АЛЕ́КСА**, бел. дойлід 2-й пал. 13 ст., які паводле загаду валынскага кн. Уладзіміра Васількавіча ў 1276 залажыў крэпасць Камянец на р. Лясная. Мяркуюць, што А. ў 1271—89 пабудаваў *Камянецкую вежу*.

**АЛЕКСАНДРА́ВІЧУС** (Aleksandravičius) Пятрас Повіла (н. 21.10.1906, с. Кросна Лаздзійскага р-на, Літва), літоўскі скульптар. Нар. мастак Літвы (1956). Вучыўся ў Каўнаскай маст. школе (1928—33). З 1941 выкладаў у Вільнюскай маст. акадэміі, з 1945 — у Вільнюскім маст. ін-це, з 1951 — у Маст. ін-це Літвы (праф. з 1946). Аўтар партрэтаў Ю.Жэмайтэ (Дзярж. прэмія СССР 1951), Э.Межэлайціса (1963), рэжысёра Ю.Мільціниса (1972); дэкар. кампазіцый «Дзяўчына з кветкамі» (1948), «Рыбакі» (1955); помніка А.Венуалісу ў г. Анікшчай (1982) і інш.

П.Александравічус. Партрэт рэжысёра Ю.Мільціниса. Гіпс. 1972.

**АЛЕКСАНДРО́ВІЧ** Андрэй Іванавіч (22.1.1906, Мінск — 6.1.1963), бел. паэт. Чл.-кар. АН Беларусі (1936). Скончыў БДУ (1930). Адзін з арганізатараў літ. аб'яднання *«Маладняк»*. У 1934—37 нам. старшыні праўлення СП Беларусі. У 1931—37 чл. ЦВК БССР, у 1936—37 канд. у чл. ЦК КП(б)Б. У 1938 рэпрэсіраваны; тэрмін адбываў на Поўначы. У 1947—49 у Мінску. У 1949—55 у ссыльцы ў Краснаярскім краі. Рэабілітаваны ў 1955. Друкаваўся з 1921. Аўтар зб-каў вершаў «Камсамольская нота» (з А.Вольным, 1924), «Па беларускім бруку» (1925), «Угрунь» (1927), «Гудкі» (1930), «Узброеныя песні» (1936) і інш. У паэме «Цені на сонцы» (1930) «выкрыў», а фактычна зняславіў вядомых бел. літаратараў і вучоных. У дакладзе на III пленуме праўлення СП СССР (1936) называў В.Дуніна-

А.І.Александровіч.

Марцінкевіча «паэтам прыгонніцтва», Ф.Багушэвіча — «вяшчальнікам народжанай нацыянальнай буржуазіі», М.Багдановіча — «буржуазна-нацыяналістычным» паэтам, а яго мову «кніжнай, халоднай», Я.Купалу і Я.Коласа — ідэолагамі «так званага «адраджэння» — руху беларускай буржуазіі», газ. «Наша ніва» — «буржуазна-нацыяналістычнай», на старонках якой панаваў «заалагічны шавінізм». Граміў бел. мовазнаўцаў. У выдадзеным пад яго рэдакцыяй «Руска-беларускім слоўніку» (1937) парушаў лексічныя нормы бел. мовы, падганяючы іх пад рус. мову. Аўтар кн. для дзяцей «Шчаслівая дарога» (1935), «Казка пра пана Жываглота» (1935), «Падарунак дзеткам-малалеткам» (1936) і інш. Пер. на бел. мову паэму А.Пушкіна «Руслан і Людміла», творы рус., укр. і інш. паэтаў і празаікаў.

*Тв.:* Зб. твораў. Т. 1—2. Мн., 1963; Творы. Мн., 1981. *І.У.Саламевіч.*

**АЛЕКСАНДРО́ВІЧ** Ануфрый, музыкант-валтарніст, капельмайстар і педагог пач. 19 ст. У 1804—09 працаваў у Нясвіжы ў прыдворнай капэле Радзівілаў, быў яе апошнім капельмайстрам, навучаў музыцы прыгонных.

Да арт. **Алейронавыя зярняты.** Алейронавы слой: 1 — просты ў жытнёвым зярняці; 2 — просты ў семядолях гароху; 3 — складаны ў эндасперме клешчавіны.

**АЛЕКСАНДРО́ВІЧ** Аркадзь Уладзіміравіч (1889 — ?), бел. спартсмен. Неаднаразовы чэмпіён і рэкардсмен Пецярбурга і Расіі ў падыманні цяжару. У 1913, заснаваўшы ў Мінску аддзяленне спарт. т-ва «Санітас», разам з У.*Сакалдзінскім* пачаў развіваць гіравы спорт, барацьбу.

**АЛЕКСАНДРО́ВІЧ** Канстанцін, жывапісец-партрэтыст 2-й пал. 18 ст. (вядомы творы 1777—94). Працаваў на Беларусі (Нясвіж) і ў Варшаве. Выконваў пераважна заказы арыстакратаў і каралеў; рабіў таксама копіі з партрэтаў мінулых эпох. Працягваючы традыцыі параднага партрэта 17—18 ст., творча ўдасканальваў жанр дакладнай характарыстыкай, выкарыстаннем чыстага колеру, увагай да дэталяў. Найбольш вядомы твор — партрэт князя Карла Радзівіла пане Каханку (1786). Творы захоўваюцца ў Польшчы, Вільні. У Львове зберагаецца 35 работ, пераважна копіі т.зв. гіст. партрэтаў з калекцыі маёнтка Завушша каля Нясвіжа.

С.Х.Александровіч.

*Г.Г.Сакалоў-Кубай.*

**АЛЕКСАНДРО́ВІЧ** (Alexandrowicz) Станіслаў (н. 5.4.1931, Вільня), польскі гісторык. Д-р гуманітарных навук (1976). Скончыў Пазнанскі ун-т імя А.Міцкевіча (1955), працаваў у ім выкладчыкам гісторыі СССР. Праф. Тарунскага ун-та і Беластоцкай філіі Варшаўскага ун-та. Аўтар прац па гісторыі мястэчак, рамяства, гандлю на Беларусі і ў Літве 16—17 ст. Даследуе гісторыю картаграфіі Польшчы, Беларусі, Літвы і Маскоўскай дзяржавы 15—18 ст.

*Тв.:* Rozwój kartografii Wielkiego Księstwa Litewskiego od XV do połowy XVIII wieku. [Cz. 1—2]. 2 wyd. Poznań, 1989.

**АЛЕКСАНДРО́ВІЧ** Сцяпан Хусейнавіч (15.12.1921, г. Капыль — 1.5.1986), бел. літ.-знавец, крытык, пісьменнік. Д-р філал. н. (1972), праф. (1974). Скончыў БДУ (1950). З 1959 у Ін-це л-ры АН Беларусі, з 1963 у БДУ. Друкаваўся з 1946. Даследаваў гісторыю бел. л-ры. У манаграфіі «Пуцявіны роднага слова» (1971) на багатым, пераважна новым фактычным матэрыяле прааналізаваў гісторыю станаўлення новай бел. л-ры, нац. кнігадрукавання і перыёдыкі 2-й пал. 19 — пач. 20 ст. Развіваў жанры пісьменніцкай біяграфіі, краязнаўчага і біягр. нарыса («Незабыўнымі сцежкамі», 1959, дап. выд. 1962; «Па слядах паэтычнай легенды», 1965; «Тут зямля такая», 1974). Стварыў літ. партрэты бел. пісьменнікаў П.Багрыма, Ф.Савіча, Ф.Багушэвіча, К.Каганца, Я.Купалы, Я.Коласа, Цёткі, З.Бядулі, К.Чорнага, Ц.Гартнага, А.Гурло і інш. Аўтар аповесцяў пра жыццё і творчасць Я.Коласа («Ад роднае зямлі...», 1962, «На шырокі прастор», 1972, «Крыжавыя дарогі», 1985). Даследаваў жыццё і дзейнасць Ф.Скарыны, гісторыю народніцкага час. «Гоман», газет «Наша доля», «Наша ніва», «Дзянніца», «Светач», майстэрства Я.Купалы-перакладчыка, сувязі яго з польск. л-рай, сувязь з Беларуссю і бел. культурай А.Міцкевіча, Т.Шаўчэнкі, Я.Райніса. Узбагаціў крыніцазнаўчую базу бел. л-ры, крытыкі і публіцыстыкі (хрэстаматыі па бел. л-ры 19 і пач. 20 ст.; «Публіцыстыка беларускіх народнікаў», 1983; «Успаміны пра Цішку Гартнага», 1984; усе ў сааўт.). Аповесць «Далёкія зарніцы» (1967) пра гераізм

Бронзавае наверша з Александропальскага кургана.

народа ў Айч. вайну. Падрыхтаваў да выдання кн. твораў Ф.Багушэвіча, К.Каганца, Цёткі, А.Паўловіча і інш.

*Тв.:* Старонкі братняй дружбы. Мн., 1960; Гісторыя і сучаснасць. Мн., 1968; Вальнадумца з-пад Нясвіжа Аляксандр Незабытоўскі. Мн., 1975; Кнігі і людзі. Мн., 1976; Слова — багацце. Мн., 1981. *І.У.Саламевіч.*

**АЛЕКСАНДРО́ВІЧ** Хасень Мустафавіч (н. 20.4.1924, г. Клецк), бел. хімік. Д-р хім. н. (1970), праф. (1972). З 1959 у Ін-це агульнай і неарган. хіміі АН Беларусі. Навук. даследаванні па фіз.-хім. асновах селектыўнай флатацыі сільвініту паверхнева-актыўнымі рэчывамі, тэхналогіі вытв-сці мінер. угнаенняў з калійных рудаў Старобінскага радовішча.

*Тв.:* Основы применения реагентов при флотации калийных руд. Мн., 1973; Физикохимия селективной флотации калийных солей. Мн., 1983.

**АЛЕКСАНДРО́ВІЧ** Якуб Мустафавіч (н. 15.1.1934, г. Клецк), бел. вучоны-эканаміст. Д-р эканам. н. (1990), праф. (1991). Скончыў Бел. ін-т нар. гаспадаркі (1957). У 1961—67 у Ін-це эканомікі АН Беларусі. З 1968 у НДІ эканомікі Мін-ва эканомікі Рэспублікі Беларусь. Асн. кірунак навук. дзейнасці — праблемы рэгіянальнай эканомікі, распрацоўка эканам. прагнозаў і комплексных праграм.

*Тв.:* Региональное планирование: Вопр. развития и размещения производительных сил БССР. Мн., 1982.

**АЛЕКСАНДРО́ВІЧ** Ян, бел. гравёр і разьбяр па шкле 18 ст. Пачынальнік дынастыі гутнікаў і гравёраў па шкле, якія працавалі на *Урэцкай мануфактуры* Радзівілаў (Любанскі р-н). У 1761—86 адзін з галоўных і найб. кваліфікаваных гравіроўшчыкаў і разьбяроў. Гравіраваў на сталовым посудзе і люстэрках партрэтныя выявы і фігуратыўныя сцэны.

**АЛЕКСАНДРО́ВІЧЫ**, шляхецкі род герба «Александровіч», прадстаўнікі якога ў 16 — пач. 19 ст. займалі высокія дзярж. пасады ў ВКЛ, Рэчы Паспалітай, Герцагстве Варшаўскім, Рас. імперыі. Мелі буйныя зямельныя ўладанні ў Лідскім, Гарадзенскім і інш. пав. Найб. вядомыя А.:

Альберт, канюшы вял. князя ВКЛ у 1530-я г. Рыгор, кашталян віленскі і вял. гетман літоўскі ў 16 ст. Стафан Яўстафій (? — 1700), маршалак гарадзенскі з 1684, кашталян новагародскі з 1698. Міхал, харужы з 1701, маршалак лідскі з 1704. Францішак Антоні, сын Лукаша, харужы (1759), падкаморы (1769), маршалак (1783), кашталян (1793) лідскі. Дамінік, сын Лукаша, маршалак трыбунала літоўскага з 1770, канюшы вял. князя ВКЛ у 1772—91.

Антоні Феліцыян, абат, сакратар *Няспыннай Рады* ў 1778—80, вял. пісар каронны. Тамаш Валяр'ян (? — 29.9.1794), сын Марціна, кашталян (з 1779), ваявода (з 1789) падляшскі, маршалак караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага, член Няспыннай Рады ў 1780—84. Падпісаў акт *Канстытуцыі 3 мая 1791.* Станіслаў (1781 — 13.8.1826), сын Тамаша, сенатар-кашталян у Каралеўстве Польскім у 1824—26. У 1800 атрымаў ад аўстр. імператара Франца II тытул графа.

*І.Р.Казлоўскі.*

**АЛЕКСАНДРО́ПАЛЬСКІ КУРГА́Н**, Лугавая Магіла, адзін з найбуйнейшых (выш. 21 м) скіфскіх «царскіх» курганоў каля в. Александропаль (Нікапальскі р-н, Украіна). Быў абнесены ровам і земляным валам. Выяўлены з разрабаваныя яшчэ ў старажытнасці катакомбы, у якіх знаходзіліся шкілеты багатых скіфаў, іх абслугі, коней (15), рэшткі калясніц, бронзавыя навершы, залатыя і сярэбраныя вырабы — узоры скіфскага і скіфска-грэч. мастацтва.

**АЛЕКСАНДРО́ЎСКАЯ** Ларыса Пампееўна (15.2.1904, Мінск — 23.5.1980), бел. спявачка (сапрана), рэжысёр і грамадскі дзеяч. Нар. арт. Беларусі (1938), нар. арт. СССР (1940). Скончыла Бел. муз. тэхнікум (1928, клас В.*Цвяткова*), опернае майстэрства ўдасканальвала ў А.*Баначыча* (1930—33). У 1919—24

удзельніца арганізаванай ёю самадз. трупы пры палітаддзеле Зах. фронту. У оперы дэбютавала ў 1928 партыяй Маргарыты («Фауст» Ш.Гуно, спектакль муз. тэхнікума). Да 1960 салістка, у 1951—60 і гал. рэжысёр Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі. Валодала голасам шырокага дыяпазону, выконвала сапранавыя і мецца-сапранавыя партыі. Музыкальнасць, драм. тэмперамент і артыстызм абумовілі моцнае эмац. ўздзеянне створаных ёю вобразаў. Сярод партый у нац. спектаклях: Марыся і Алеся («Міхась Падгорны» і «Алеся» Я.Цікоцкага), Надзейка («Кветка шчасця» А.Туранкова), Марыя Грагатовіч («Кастусь Каліноўскі» Дз. Лукаса). Своеасаблівасцю вак.-сцэнічнай трактоўкі, пранікнёным лірызмам вызначаліся партыі ў класічных операх: Кармэн («Кармэн» Ж.Бізэ), Таццяна, Ліза («Яўген Анегін», «Пікавая дама» П.Чайкоўскага), Яраслаўна, Канчакоўна («Князь Ігар» А.Барадзіна), Любаша («Царская нявеста» М.Рымскага-Корсакава) і інш. Рэжысёр пастановак: «Запарожац за Дунаем» С.Гулак-Арцямоўскага (1951), «Страшны двор» С.Манюшкі і «Мазепа» Чайкоўскага (1952), «Дзяўчына з Палесся» Я.Цікоцкага і «Аіда» Дж.Вердзі (1953), «Барыс Гадуноў» М.Мусаргскага (1954), «Надзея Дурава» А.Багатырова (1956), «Міхась Падгорны» (1957), «Яснае світанне» Туранкова (1958), «Пікавая дама» (1960) і інш. Выступала як канцэртная спявачка, выконвала бел. нар. песні, у тл. на Міжнар. муз. выстаўцы ў Франкфурце-на-Майне (1927), гастраліравала ў Германіі, Швецыі (з С.*Навіцкім*; першы выезд бел. артыстаў за мяжу ў сав. час). Адна з арганізатараў Бел. тэатр. аб'яднання (з 1946 старшыня, з 1976 ганаровы старшыня яго прэзідыума). Дзярж. прэмія СССР 1941. З 1987 праводзіцца Рэсп. конкурс вакалістаў імя А., у 1992 устаноўлена прэмія імя А. у галіне тэатр. мастацтва.

*Літ.:* Модэль М. Л.П.Александроўская. Мн., 1945; Рузов Г. Л.П.Александровская. М.; Л., 1950; Лукас Д., Жураўлёў Д. Выдатны дзеяч опернага мастацтва // Майстры беларускай сцэны. Мн., 1960.

*Б.С.Смольскі.*

**АЛЕКСАНДРО́ЎСКІ БОЙ 1942**. Адбыўся паміж партызанамі атрада М.М.Нікіціна (з ліп. партыз. брыгада М.М.Нікіціна) і ням.-фаш. карнікамі ў ліп. 1942 у Дзяржынскім р-не Мінскай вобл. ў Вял. Айч. вайну. 14.6.1942 атрад карнікаў з 9 бронемашынамі і 6 танкамі ва ўрочышчы Доўгі Востраў (каля в. Александрова Дабрынёўскага с/с) акружыў партызан (120 чал.), якія на працягу 8 гадзін адбілі 21 атаку гітлераўцаў і прарвалі акружэнне. Гітлераўцы спалілі в. Александрова і расстралялі яе мужчынскае насельніцтва.

**АЛЕКСА́НДРЫ** (Alecsandri) Васіле (21.7.1821, г. Бакэу, Румынія — 22.8.1890), малдаўскі і румынскі пісьменнік, тэатр. дзеяч, збіральнік фальклору. Вучыўся ў Парыжы (1834—39). У сатыр. п'есах «Іоргу з Садагура» (1844), «Ясы ў час карнавалу», «Кірыца ў правінцыі» (абедзве 1852), казцы «Гісторыя аднаго залатога» (1843) і інш. адлюстраваў рэчаіснасць тагачаснай Малдавіі. Пад уплывам нар. творчасці напісаў вершаваны цыкл «Дойны» (1848—49, асобнае выд. 1853) і зб. «Народныя вершы» (1852). Аўтар гіст. паэмы «Чырвоная дуброва» (1872), гіст. драмы «Ваявода-дэспат» (1880), феерыі «Сінзіяна і Пепеля» (1883) і інш.

*Тв.:* Опере. Вол. 1—4. Кишинэу, 1958—59; Рус. пер. — Избр. М., 1959; Стихотворения. М., 1975.

**АЛЕКСАНДРЫ́ЙСКАЕ МІЖЛЕДАВІКО́ЎЕ** (ад назвы в. Александрыя ў Шклоўскім р—не Магілёўскай вобл.), ліхвінскае міжледавікоўе, міндэль—рыскае міжледавікоўе, міжледавіковая эпоха пач. сярэдняга антрапагену (320—460 тыс. г. назад). Наступіла пасля бярэзінскага зледзянення і папярэднічала макс. на

Л.Александроўская ў ролі Канчакоўны.

Беларусі *дняпроўскаму зледзяненню*. Доўжылася 140 тыс. гадоў. Адклады А.м. залягаюць на глыбіні ад 5—10 м на ПдЗ і З рэспублікі да 50—80 м у сярэдняй і паўн. частках; з'яўляюцца гарызонтам, які падзяляе антрапагенавую тоўшчу на 2 роўныя па магутнасці часткі. Ёсць у пахаваных рачных далінах, азёрных і балотных катлавінах, ледавіковых лагчынах. Прадстаўлены азёрнымі (супескі, суглінкі, дыятаміты, сапрапеліты, мергелі, алеўрыты), балотнымі (торф, гумусавыя супескі), алювіяльнымі (пяскі з лінзамі торфу, суглінку, супеску) утварэннямі. Вылучаецца значнай працягласцю, субатлантычным умерана цёплым кліматам, найб. падабенствам да пліяцэну па палеагеаграфічных умовах. *М.Я.Зусь.*

**АЛЕКСАНДРЫ́ЙСКАЯ БІБЛІЯТЭ́КА**, найбуйнейшы ў старажытнасці збор рукапісных кніг (ад 100 да 700 тыс. тамоў). Засн. ў пач. 3 ст. да н.э. ў г. Александрыя пры *Александрыйскім мусеяне*. Пераважалі творы стараж.-грэч. л-ры і навукі, былі і кнігі на ўсх. мовах. Узначальвалі А.б. буйнейшыя вучоныя: Эратасфен, Зенадот, Арыстарх Самоскі, Калімах. Пры б-цы працавала шмат капіістаў-перапісчыкаў кніг. Частка А.б.

Л.П.Александроўская.

згарэла ў 47 да н.э. ў час Александрыйскай вайны. Пазней адноўлена і папоўнена за кошт Пергамскай б-кі. Частка кнігазбору знішчана ў 391 н.э., апошнія рэшткі загінулі ў 7—8 ст. у час арабскіх заваёў.

**АЛЕКСАНДРЫ́ЙСКАЯ ПАЭ́ЗІЯ**, паэзія эпохі элінізму, названая па найбуйнейшым яе цэнтры Александрыі Егіпецкай. Бытавала ў 4—1 ст. да н.э. на тэр. б. імперыі Аляксандра Македонскага. Характэрныя рысы: адмаўленне ад грамадз. тэматыкі, паглыблены псіхалагізм і ўвага да асабістых перажыванняў асобы, павышаная цікавасць да асобных дэталяў побыту, аслабленне веры ў багоў (міф ператвараецца ў займальную казку). У А.п. пераважала любоўная тэма, сярод жанраў — гімн, элегія, ямб, эпіграма, ідылія. Прадстаўнікі А.п.: Калімах, Апалоній Радоскі, Лікафрон, Феакрыт.

**АЛЕКСАНДРЫ́ЙСКІ ВЕРШ**, у франц. паэзіі — 12-складовы верш з націскам на 6-м і 12-м складах, цэзурай пасля 6-га склада і парнай рыфмоўкай; у ням. і рус. вершаскладанні перадаецца 6-стопным ямбам з цэзурай пасля 3-й стопы. Назву звязваюць з франц. паэмай пра Аляксандра Македонскага (12 ст.), напісанай такім вершам. У рус. паэзію А.в. увёў В.Традзякоўскі, асабліва пашырэнне атрымаў у творчасці А.Пушкіна. У бел. паэзіі А.в. карыстаўся М.Багдановіч (вершы «Перапісчык», «Летапісец»).

**АЛЕКСАНДРЫ́ЙСКІ МУСЕ́ЯН** (ад грэч. museion храм або святілішча музаў), адзін з галоўных навук. і культ. цэнтраў ант. свету. Засн. ў г. Александрыя ў 3 ст. да н.э. Пталамеем Сотэрам I па ініцыятыве Дэметрыя Фалерскага. Створаны на ўзор афінскіх філас. школ, у прыватнасці лікея. Узначальваў А.м. жрэц вышэйшага рангу, які ў эліністычны перыяд прызначаўся царом,

пазней — рымскім імператарам. Вучоныя, што працавалі ў А.м., знаходзіліся на поўным утрыманні александрыйскіх правіцеляў. Росквіт А.м. прыпадае на 3—2 ст. да н.э. Вял. поспехі дасягнуты ў матэматыцы і фізіцы (Эўклід, Апалоній Пергскі, Архімед), астраноміі (Эратасфен, Гіпарх), медыцыне (Герафіл, Эрасістрат), механіцы (Ктэсібій, Філон), а таксама ў філалогіі. Пазней з А.м. звязана дзейнасць Пталамея Клаўдзія і Галена. Пры А.м. знаходзілася *Александрыйская бібліятэка*. У рымскі перыяд А.м. паступова страчвала сваё значэнне. У 272—273 войскі імператара Аўрэліяна пры ўзяцці Александрыі спалілі А.м.

*Літ.:* Рожанский И.Д. История естествознания в эпоху эллинизма и Римской империи. М., 1988. С. 125—131; Левек П. Эллинистический мир: Пер. с фр. М., 1989.

*Н.К.Мазоўка.*

**АЛЕКСАНДРЫ́НСКІ ТЭА́ТР**, назва *Санкт—Пецярбургскага акадэмічнага тэатра драмы* імя А.С.Пушкіна ў 1832—1920.

**АЛЕКСАНДРЫ́Т**, мінерал, рэдкая празрыстая разнавіднасць *хрызаберылу*. Састаў берыліева-алюмініевага вокіслу ($BeAl_2O_4$), з прымессю вокіслу хрома ($Cr_2O_3$). Крышталі тоўстатаблітасныя, псеўдагексаганальныя. Колер ізумрудна-зялёны, пры штучным асвятленні — вішнёва- ці фіялетава-чырвоны, ружовы. Бляск шкляны. Цв. 8,5. Шчыльн. каля 3,7 г/см$^3$. Трапляецца ў пегматытавых жылах. Радовішчы на Урале, у Бразіліі, на Пд Афрыкі, Мадагаскары і Цэйлоне. А. масай больш за 2—3 караты і густа афарбаваныя лічаць каштоўнымі камянямі. А. называюць таксама светла-зялёную разнавіднасць штучнага карунду.



Александрыт.

**АЛЕКСАНДРЫ́Я** (араб. Аль-Іскандарыя), горад на Пн Егіпта. Адм. ц. мухафазы Александрыя. Размешчаны паміж Міжземным м. і воз. Мар'ют. Другі па насельніцтве (3,2 млн. ж., 1987) і эканам. значэнні (пасля Каіра) горад краіны. Гал. марскі порт Егіпта (даступны для акіянскіх суднаў), звязаны суднаходным каналам з Нілам. Вузел чыгунак і аўтадарог. Цераз А. ажыццяўляюцца $^4/_5$ знешніх перавозак Егіпта. Буйны гандл.-прамысл. цэнтр. Нафтаперапр., хім., металургічная, маш.-буд., металаапр., радыёэлектронная, цэментная, тэкст., харч., гарбарна-абутковая, папяровая прам-сць; выт-сць аўтапакрышак; суднабудаванне і суднарамонт. Разнастайныя рамёствы. Гандаль бавоўнай, збожжам і інш. Ун-т. У прыгарадах А. — летні марскі курорт.

Засн. ў 332—331 да н.э. *Аляксандрам Македонскім*, які назваў горад сваім імем і зрабіў яго марской базай для далейшага зававання Усходу. Пры *Пталамеях* сталіца Егіпта. Цэнтр *эліністычнай культуры*. Тут знаходзіліся *Александрыйскі мусеян*, *Александрыйская бібліятэка*. З 30 да н.э. А. ў складзе Рым. імперыі, з канца 4 ст. н.э. — Візантыі. Адзін з гал. цэнтраў ранняга хрысціянства. З 7 ст. н.э. пад уладай арабаў. У 1517 заваявана туркамі і разбурана. Адноўлена ў 1-й пал. 19 ст. У 1882 захоплена англічанамі і ператворана ў каланіяльны порт. У 1-й пал. 20 ст. адзін з цэнтраў нац.-вызв. руху ў Егіпце.

Антычная А. мела рэгулярную планіроўку (грэч. арх. Дэйнакрат, 4 ст. да н.э.). Са старажытнасці захавалася т.зв. калона Пампея (або Дыяклетыяна), некропалі, катакомбы. На в-ве Фарос, які злучаўся дамбай з А., стаяў славуты маяк вышынёй больш за 120 м (арх. Састрат, 3 ст. да н.э.), прылічаны да «сямі цудаў свету» (на яго месцы цяпер крэпасць Кайт-Бей — частка араб. умацаванняў).

Сучасная А. складаецца са старой ч. з вузкімі вулачкамі і новай — з шырокімі праспектамі, набярэжнай, камфартабельнымі асабнякамі і шматпавярховымі будынкамі (у т.л. марскі вакзал, аздоблены мазаікай і рэльефамі). Мячэці 17—19 ст., палацы (цяпер музеі) Рас-эт-Цін (пач. 19 ст.), Мунтаза з вял. паркам (пач. 20 ст.), Мухамеда Алі (20 ст.). Цэнтр. плошча — Ат Тахрыр з коннай статуяй Мухамеда Алі (2-я пал. 19 ст., франц. скульпт. А.Жакмар).

Ун-т, 5 музеяў, у т.л. грэка-рым. старажытнасцяў, прыгожых мастацтваў; Нац. б-ка.

Набярэжная ў Александрыі.

Александрыя. Мячэць Аль-Каід Ібрагім Машэ.

**АЛЕКСАНДРЫ́Я**, вёска ў Беларусі, у Александрыйскім с/с Шклоўскага р-на Магілёўскай вобл. Цэнтр калгаса «Дняпроўскі». За 12 км на Пн ад Шклова, 50 км ад Магілёва, 1 км ад чыг. ст. Копысь. 333 ж., 164 двары (1995). Сярэдняя школа, б-ка.

Вядома з сярэдзіны 17 ст. як спадчыннае ўладанне ў Шклоўскім графстве Аршанскага

пав. Пасля далучэння да Рас. імперыі (1772) мястэчка ў Копыскім пав., з 1775 уладанне графа С.Г.Зорыча. У 1886 у А. 312 ж. З 1924 цэнтр сельсавета ў Копыскім р-не Аршанскай акр., з 8.7.1931 вёска ў Шклоўскім р-не.

**«АЛЕКСАНДРЫ́Я»**, помнік сусв. л-ры, які апісвае жыццё, подзвігі і прыгоды *Аляксандра Македонскага*. Нап. ў 2—3 ст. ў Егіпце на грэч. мове і паслужыла крыніцай для шматлікіх празаічных і вершаваных перапрацовак і рэдакцый. Аляксандр паказаны выдатным палкаводцам і ўсемагутным валадаром, чалавекам высокіх фіз. і маральных якасцяў, моцнага характару, глыбокага розуму. Сюжэт «А.» займальны, драматычна напружаны. Першыя бел. пераклады «А.» з'явіліся ў 15 ст. На Беларусі бытавалі ў 2 рэдакцыях — лацінскай і сербскай. Крыніцай бел. перакладу лацінскай рэдакцыі было адно з польскіх друкаваных выданняў 16 ст. Яна больш сугучная раннегуманіст. ідэалам духоўнай велічы і годнасці чалавека, яго зямных спраў. Сербская рэдакцыя пазнейшая, з новымі героямі, інакшым выкладам некат. падзей і эпізодаў, перапрацавана ў духу хрысц. ідэалогіі, з больш моцным гучаннем тэмы марнасці чалавечага жыцця. Бел. пераклады «А.» — важная крыніца пазнання этычных і эстэт. уяўленняў і маст. густаў бел. чытачоў эпохі феадалізму, вывучэння бел. літ. мовы. Бел. спісы «А.» апубл. У.В.Анічэнка ў кн. «Александрыя» (1962).

*В.А.Чамярыцкі.*

**АЛЕКСАНДРЭ́СКУ** (Alexandrescu) Сікэ Васіле (15.9.1896 — 1973), румынскі рэжысёр. Нар. арт. Румыніі (1959). У тэатры з 1913. З 1947 гал. рэжысёр Нац. т-ра ў Бухарэсце, з 1967 дырэктар Драм. т-ра ў Брашове. Садзейнічаў уключэнню ў рэпертуар нац. драматургіі, развіццю рэаліст. традыцый: «Безыменная зорка» М.Себасцьяна, «Рэвізор» М.Гогаля, «Самадуры» К.Гальдоні. Дзярж. прэміі Румыніі 1954 («Згубленае пісьмо» І.Л.Караджале) і 1957 («Асабістая справа» А.П.Штэйна).

**АЛЕКСАНДЭ́Р** (Alexander) Дэнтан Юджын (н. 18.12.1917, Патомак, штат Ілінойс, ЗША), амерыканскі генетык і селекцыянер раслін. Праф. (1963). Замежны чл. УАСГНІЛ (1970). Скончыў Ілінойскі ун-т (1941). З 1951 на агранам. ф-це гэтага ун-та. Навук. працы па тэарэт. і метадычных пытаннях генетыкі і селекцыі раслін. Распрацаваў генет. асновы селекцыі кукурузы. Стварыў некалькі дзесяткаў ліній і гібрыдаў высокаўраджайнай кукурузы з павышанай колькасцю незаменных амінакіслот і бялкоў.

**АЛЕКСА́НДЭР ТУНІ́СКІ** (Alexander of Tunis) Харалд Руперт Леафрык Джордж (10.12.1891, Лондан — 16.6.1969), ваенны і дзярж. дзеяч Вялікабрытаніі. Фельдмаршал (1944), граф (1952). Скончыў каледжы Хараў і Сандхерст. У 1-ю сусв. вайну камандаваў брыгадай. У 2-ю сусв. вайну — эвакуацыяй брыт. войскаў з-пад Дзюнкерка (1940), з 1942 — войскамі на Сярэднім Усходзе і Пн Афрыкі, са снеж. 1943 галоўнакаманд. саюзнымі войскамі на Міжземнаморскім тэатры: наступленнем у Тунісе, на Сіцыліі і Пд Італіі. У 1946—52 ген.-губернатар Канады, у 1952—54 міністр абароны.

**АЛЕКСІЕ́ВІЧ** Святлана Аляксандраўна (н. 31.5.1948, г. Івана-Франкоўск), бел. пісьменніца. Скончыла БДУ (1972). З 1966 на пед. рабоце, пасля журналістка. Літ. дзейнасць пачала ў 1975 як празаік-дакументаліст. У кн. «У вайны — не жаночы твар...» (1985) расказала пра подзвіг жанчын-франтавічак, партызанак, падпольшчыц. Дзецям, што перажылі ням.-фаш. акупацыю, прысвяціла кн. «Апошнія сведкі» (1985). Амаральнасць і злачыннасць вайны ў Афганістане паказала ў кн. «Цынкавыя хлопчыкі» (1991). Па сцэнарыях А. пастаўлены спектаклі і дакумент. фільм «У вайны — не жаночы твар...» (1980, 1983; Дзярж. прэмія СССР 1985). Аўтар п'есы «Марутка» (1987). Прэмія Ленінскага камсамола 1986.

*Тв.:* Зачараваныя смерцю. Мн., 1993.

*І.У.Саламевіч.*

**АЛЕ́КСІ-МЕСХІШВІ́ЛІ** Уладзімір Шалвавіч (28.9.1915, Тбілісі — 1978), грузінскі архітэктар. Засл. дз. маст. Грузіі (1961). Скончыў Грузінскі індустр. ін-т у Тбілісі (1939). Выкладаў у Грузінскім політэхн. ін-це. У творчасці імкнуўся да прастаты арх. формаў, выяўлення мастацка-пластычных уласцівасцяў матэрыялу. Работы: Палац спорту (у сааўт.) і Грузінскі с.-г. ін-т у Тбілісі, дом адпачынку ў Піцундзе; адна са станцый Тбіліскага метрапалітэна.

**АЛЕ́КСІН** Анатоль Георгіевіч (н. 3.8.1924, Масква), рускі пісьменнік. Скончыў Маскоўскі ін-т усходазнаўства (1950). Чл.-кар. АПН СССР (1982). Піша пераважна для дзяцей. Аўтар аповесцяў «Трыццаць адзін дзень» («Дзённік піянера Сашы Васількова», 1950), «Запіскі Эльвіры» (1956), «Позняе дзіця» (1968), «Дзеючыя асобы і выканаўцы» (1972), «У тыле як у тыле» (1978), «Раздзел маёмасці», «Сардэчная недастатковасць» (абедзве 1979), «Здаровыя і хворыя» (1982) і інш. Дзярж. прэмія СССР 1978.

*Тв.:* Собр. соч. Т. 1—3. М., 1979—81.

**АЛЕ́КСІНІЧЫ**, вёска ў Беларусі, у Сенненскім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Запаветы Ільіча». За 22 км на У ад г. Сянно, 46 км ад Віцебска, 28 км ад чыг. ст. Багушэўская. 448 ж., 183 двары (1994). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызанаў.

У гіст. крыніцах упершыню ўпамінаецца пад 1512. Належала да маёнтка Палонна ў Віцебскай зямлі. У розны час А. валодалі Пацы, Астрожскія, Слуцкія, Хадкевічы, Сапегі, Друцкія-Любецкія, Стаброўскія і інш. У пач. 20 ст. вёска (сяло) у Пустынскай вол. Сенненскага пав.; 836 ж., 137 дамоў, правасл. царква. З 1924 цэнтр сельсавета.

**АЛЕКСІ́С** (Alexis) Жак Стэфен (22.4.1922, г. Ганаіў, Гаіці — крас. 1961), гаіцянскі пісьменнік. Урач-неўрапатолаг. Пісаў на франц. мове. Забіты агентамі дыктатара Дзювалье. Аўтар раманаў «Добры генерал Сонца» (1955), «Дрэвы-музыканты» (1957), «Вокамгненна» (1959), кн. казак «Рамансера ў святле зор» (1960). У цэнтры твораў А. — вобраз шматпакутнай гаіцянскай зямлі. Яго рэалізм, жорсткі і горкі,

К.А.Алексютовіч.

адначасова мае рамантычна-палымяны характар. Прыхільнік шырокага выкарыстання фальклору ў л-ры.

*Тв.:* Рус. пер. — Добрый генерал Солнце. М., 1960; Деревья-музыканты. М., 1964.

**АЛЕКСЮТО́ВІЧ** Канстанцін Андрэевіч (20.5.1884, в. Бахаравічы Пухавіцкага р-на Мінскай вобл. — 26.2.1943), бел. балетмайстар. Скончыў Пецярбургскае тэатр. вучылішча (1906). У 1921—28 балетмайстар БДТ-1. Ставіў танцы, карагоды, гульні, абрадавыя сцэны ў драм. спектаклях («На Купалле» М.Чарота, «Машэка», «Кастусь Каліноўскі», «Каваль-ваявода» Е.Міровіча, «Панскі гайдук» Н.Бываеўскага, «Вяселле» В.Гарбацэвіча і інш.). Для развіцця бел. прафес. балетнага мастацтва прынцыповае значэнне мелі яго пастаноўкі балетаў «Капелія» Л.Дэліба, «Зачараваны лес» Р.Дрыга, «Фея лялек» І.Баера, бел. балета «Помста сябровак» (лібрэта А., музыка скампанавана Л. Маркевічам). Адначасова супрацоўнічаў з У.*Галубком* (БДТ-3). У 1930—37 балетмайстар Бел. ТРАМа і Т-ра юнага гледача, у 1937—41 гал. балетмайстар *Ансамбля беларускай народнай песні і танца Беларускай філармоніі*. Зрабіў значны ўклад у развіццё бел. сцэнічнага танца, выявіў глыбокае веданне харэагр. фальклору, беражлівае стаўленне да яго нац. рысаў, пачуццё тэатральнасці. Стварыў танец «Бульба», сцэн. варыянты многіх традыц. нар. танцаў («Лявоніха», «Крыжачок», «Мяцеліца», «Мікіта», «Таўкачыкі», «Юрачка», «Лянок» і інш.), а таксама кадрыляў, карагодаў, гульняў.

*Літ.:* Алексютович Л.К. Балетмейстер Константин Алексютович. Мн., 1984.

**АЛЕКСЮТО́ВІЧ** Ларыса Канстанцінаўна (н. 20.1.1913, Мінск), бел. танцоўшчыца, балетмайстар. Засл. дз. маст. Беларусі (1995). Дачка К.А.*Алексютовіча*. Вучылася ў балетнай студыі пры БДТ-1 (1921—28), адначасова працавала ў балетнай трупе т-ра. З 1928 артыстка Бел.

аб'яднання муз., эстрадных і цыркавых работнікаў, у 1937—41 — Ансамбля бел. нар. песні і танца Бел. філармоніі. У 1950—73 балетмайстар ансамбля танца БДУ, выкладчык Бел. харэагр. вучылішча. Ставіла танцы ў драм. спектаклях. Стварыла шэраг сцэнічных танцаў на традыц. аснове («Ручнікі», «Вязанка», «Кола» і інш.). Аўтар вучэбнага дапаможніка «Беларускія народныя танцы, карагоды, гульні» (1978), кнігі пра бацьку «Балетмайстар Канстанцін Алексютовіч. Жыццё і творчы шлях» (1984).

**АЛЕКСЮТО́ВІЧ** Мікалай Астапавіч (5.2.1921, в. Бахаравічы Пухавіцкага р-на Мінскай вобл. — 27.4.1967), бел. філосаф. Скончыў БДУ (1952). Канд. філас. н. (1955). З 1952 у Ін-це філасофіі і права АН Беларусі, з 1963 у Бел. тэхнал. ін-це. Даследаваў гісторыю грамадска-паліт. і філас. думкі, гісторыю рэлігіі і атэізму на Беларусі эпохі сярэднявечча, асветніцкую дзейнасць, літ. творчасць і светапогляды Ф.Скарыны, С.Буднага, В.Цяпінскага, Л.Зізанія і інш. Аўтар прац «Скарына, яго дзейнасць і светапогляд» (1958), «Святло ў цемры» (1960) і інш. Адзін з аўтараў і складальнікаў кн. «З гісторыі філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі» (1962).

**АЛЕКСЯЙЧУ́К** Цімафей Данілавіч (н. 6.2.1921, г.п. Камарычы Бранскай вобл.), Герой Сав. Саюза (1944). Беларус. Скончыў ваен.-пяхотнае вучылішча (1941), Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1947). З ліст. 1942 на Закаўказскім, Паўн.-Каўказскім і 1-м Укр. франтах. 31.12.1943 батальён пад камандаваннем А. першы ўварваўся ў г. Жытомір, знішчыў 10 танкаў праціўніка. Да 1977 у Сав. Арміі.

**АЛЕ́КШЫЦЫ**, вёска ў Бераставіцкім р-не Гродзенскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Леніна. За 18 км на Пн ад г.п. В. Бераставіца, 40 км ад Гродна, 28 км ад чыг. ст. Пагранічны. 826 ж., 291 двор (1994). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аптэка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі, сталовая. Царква. Каля вёскі гарадзішча тыпу сярэдневяковых умацаванняў.

**АЛЕЛАМО́РФЫ**, тое, што *алелі*.

**АЛЕЛАПА́ТЫЯ** (ад грэч. allēlōn адзін аднаго, узаемна + *...патыя*), узаемадзеянне раслінных арганізмаў у *фітацэнозах* праз вылучэнне ў асяроддзе спецыфічных хім. рэчываў (*фітанцыдаў, маразмінаў, калінаў, антыбіётыкаў* і інш.). Выяўляецца прыгнечаннем адных відаў раслін іншымі (напр., пырнік і іншае пустазелле выцясняюць або прыгнечваюць развіццё культ. раслін; арэшнік, дуб, елка сваімі выдзяленнямі прыгнечваюць рост траў пад кронамі), зрэдку спрыяльным для сумеснага існавання ўзаемаўплывам (напр., у віка-аўсянай сумесі; пасевах кукурузы з сояй і інш.). Адыгрывае значную ролю ў працэсах узнікнення, развіцця і змены раслінных згуртаванняў. Улічваецца пры стварэнні зялёных насаджэнняў, абгрунтаванні севазваротаў.

**АЛЕ́ЛІ** (ад грэч. allēlōn адзін аднаго, узаемна), алеламорфы, розныя формы (станы) аднаго і таго ж *гена*. Размешчаны ў аднолькавых участках (локусах) гамалагічных (парных) храмасом і кантралююць кірункі развіцця адной і той жа прыкметы (напр., белы ці чырвоны колер кветкі). А. ўзнікаюць пры любой змене структуры гена ў выніку *мутацый* або ўнутрыгенных рэкамбінацый (магчымая колькасць А. кожнага гена практычна незлічоная). Кожны ген можа знаходзіцца не менш як у двух алельных станах, адзін з якіх звычайна забяспечвае максімальнае развіццё прыкметы — дамінантная А., другі прыводзіць да частковай або поўнай страты або змены прыкметы — рэцэсіўная А. Ген, які мае некалькі розных станаў, утварае серыю множных А. Наяўнасцю алельных генаў абумоўлены фенатыпічныя адрозненні сярод арганізмаў (гл. *Фенатып*). Частоты асобных А. у генафондзе даюць магчымасць вылічаць генет. змены ў пэўнай папуляцыі і вызначаць частату генатыпаў, што выкарыстоўваюць у селекцыі для прадказання магчымых вынікаў скрыжаванняў.




Схема гома- і гетэразіготнасці па адной пары **алеляў**: 1 — гомазіготнасць; 2 — гетэразіготнасць (*A* — дамінантная алель, *a* — рэцэсіўная алель).

**АЛЕ́ЛЬКАВІЧЫ** (Алелькі, Слуцкія), княжацкі род герба «Пагоня» ў ВКЛ, адна з галін *Гедзімінавічаў*. Яго прадстаўнікі ў 15—16 ст. адыгрывалі значную ролю ў грамадскім і дзярж.-паліт. жыцці Беларусі, Украіны, Літвы і Польшчы. Найб. вядомыя А.:

Аляксандр (Алелька, ? — 1454), заснавальнік роду, сын кіеўскага князя Уладзіміра Альгердавіча. Князь капыльскі, слуцкі з 1394, кіеўскі з 1441. Вёў войны супраць татараў. Як военачальнік і дыпламат карыстаўся вял. аўтарытэтам у бел., літ. і ўкр. знаці, пасля смерці *Вітаўта* яго кандыдатура была вылучана на велікакняжацкі пасад. Удзельнічаў у міжусобнай барацьбе паміж прэтэндэнтамі на велікакняжацкі пасад Жыгімонтам Кейстутавічам і Свідрыгайлам (напачатку падтрымліваў першага, потым другога). Жыгімонт Кейстутавіч, атрымаўшы перамогу, адабраў у Аляксандра Слуцкае княства, а яго самога зняволіў у астрог. Вял. кн. Казімір IV у 1441 вярнуў яму Слуцк і даў Кіеўскае княства. Сямён (1420—3.12.1470), старэйшы сын Аляксандра, князь кіеўскі. Прэтэндаваў на велікакняжацкі пасад у 1454 і 1456, шукаў падтрымкі ў Маскве. Яго ўдава Марыя Гаштольд атрымала ад вял. кн. Пінскае княства ўзамен за Кіеўскае. Міхал (каля 1425—30.8.1481), малодшы сын Аляксандра, князь слуцкі і капыльскі. У 1470—71 намеснік вял. кн. ВКЛ у Вял. Ноўгарадзе. З мэтай скінуць Ягелонаў і стаць вял. кн. ВКЛ стварыў групоўку магнацкіх родаў. Пры няўдачы намерваўся аддзяліць ад ВКЛ усх. землі Беларусі і Украіны і перайсці з імі пад апеку вял. князя маскоўскага. За арганізацыю змовы супраць вял. кн. Казіміра IV пакараны смерцю. Васіль (каля 1425—4.6.1495), сын Сямёна, князь пінскі. Сямён (каля 1460—14.11.1505), сын Міхала, князь слуцкі. У 1502 і 1503 разбіў татараў у бітвах на р. Уза і Прыпяць. Юрый (1492—17.4.1542), сын Сямёна, князь слуцкі. Удзельнік абароны Слуцка ў час *Глінскіх мяцяжу 1508*, бітвы з татарамі ў 1511, *Аршанскай бітвы 1514*. Юрый (каля 1531—9.11.1578), сын Юрыя, князь слуцкі. Удзельнік Лівонскай вайны 1558—83. Юрый (17.8.1559 — 6.5.1586), сын Юрыя Юр'евіча, князь слуцкі, адзін з апошніх А. па мужчынскай лініі. Яго дачка Соф'я ў 1600 выйшла замуж за Я.Радзівіла. Пасля яе смерці (1612) Слуцкае і Капыльскае княствы перайшлі да Радзівілаў.

*П.Р.Казлоўскі.*

**АЛЕМА́Н** (Allemane) Жан (25.8.1843—1935), французскі сацыяліст. У перыяд *Парыжскай камуны 1871* старшыня 5-га легіёна Нац. гвардыі. Пасля паражэння камуны сасланы на пажыццёвую катаргу на в-аў Новая Каледонія (амністыраваны ў 1880). У 1882 далучыўся да *пасібілістаў*, у 1890 на чале Рабочай сацыял-рэв. партыі (гл. *Алеманісты*). У 1901, 1906 і 1910 выбіраўся ў парламент. Пасля паражэння на парламенцкіх выбарах 1914 адышоў ад паліт. дзейнасці.

**АЛЕМАНІ́СТЫ**, пашыраная назва членаў франц. Рабочай сацыял-рэв. партыі (ад прозвішча іх лідэра Ж.*Алемана*). Утварылася ў 1890 у выніку расколу партыі *пасібілістаў*. А. адвяргалі ідэю дыктатуры пралетарыяту, эканам. барацьбу ставілі вышэй за паліт., выступалі супраць гедыстаў. У 1905 увайшлі ў аб'яднаную сацыяліст. партыю.

**АЛЕМА́НЫ**, аламаны (Alemanni, Alamanni), германскае племя. Упершыню ўпамінаецца ў пач. 3 ст. У 5 ст. засялілі тэр. сучаснай паўд.-зах. Германіі, Эльзаса і ўсх. Швейцарыі. На тэр. іх рассялення дзейнічала Алеманская праўда (гл. ў арт. *Варварскія праўды*). У 10 ст. ў складзе каралеўства Германія ўтварылася племянное герцагства Алеманія, або *Швабія*. Ад слова «А.» паходзяць назвы Германіі і немцаў у шэрагу еўрап. моў.

**А́ЛЕН** (Allen) Рой Джордж Дуглас (3.6.1906, горад-графства Уорчэстэр, Вялікабрытанія — 1983), англійскі вучоны-эканаміст, матэматык, статыстык. Адукацыю атрымаў у Кембрыджы (1927). Выкладаў у Лонданскай школе

статыстыкі. У 1944—73 праф. статыстыкі Лонданскага ун-та. Навук. работы па тэорыі карыснасці і каштоўнасці, тэорыі індэксаў. Аўтар шэрагу дапаможнікаў па матэм. эканоміцы і матэм. аналізе для эканамістаў.

*Тв.:* Математическая экономия: Пер. с англ. М., 1963.

**Алі́на**, Алена Прыгожая, у старажытнагрэчаскай міфалогіі дачка *Зеўса* і Леды, жонка цара Спарты *Менелая*, якая лічылася надзвычайнай прыгажуняй. Паводле міфаў, сын траянскага цара Прыяма *Парыс* з дапамогай *Афрадыты* выкраў А., што стала зачэпкай Траянскай вайны. Міф пра А. — часты сюжэт у выяўл. мастацтве (ант. вазы, фрэскі, карціны Я.Тынтарэта, Ж.Л.Давіда), л-ры (Гамер, Эўрыпід, І.В.Гётэ), музыцы (К.В.Глюк, К.Сен-Санс, Р.Штраус) і інш.

**Алі́на Іва́наўна** (19.5.1476, Масква — 20.1.1513), дачка вял. князя маскоўскага Івана III, жонка вял. князя ВКЛ *Аляксандра*. Праз шлюб А.І. (1495) Іван III разлічваў атрымаць доступ у ВКЛ, вял. кн. Аляксандр — спыніць паліт. і ваенны наступ Маскоўскай дзяржавы на ВКЛ. Насуперак намаганням акружэння мужа А.І. засталася праваслаўная, падтрымлівала правасл. царкву ў ВКЛ, асуджала агрэсіўную палітыку Івана III у дачыненні да ВКЛ. Падтрымлівала мужа ў яго барацьбе са шляхтай за цэнтралізацыю ўлады, пасля яго смерці (1506) падтрымала *Жыгімонта I*. Валодала землямі ў Віленскім і Трокскім ваяв., каля Менска, Гародні, у памежжы з Маскоўскай дзяржавай, замкамі ў Магілёве, каля Мсціслава, у Чачэрску і інш.

**А́лена пра́віла**, правіла, якое вызначае заканамернасць змены памераў паверхні цела цеплакроўных жывёл у залежнасці ад змены кліматычных умоў. У млекакормячых жывёл на Пн часткі цела, якія выступаюць (канечнасці, вушы, хвост, шыя, лапы), карацейшыя, формы цела больш прысадзістыя, чым у прадстаўнікоў таго ж віду на Пд. У нейкай ступені А.п. справядліва і да вышэйшых раслін, парасткі якіх звычайна ўкарочаныя на Пн у параўнанні з паўд. шыротамі. Сфармулявана амер. вучоным Дж. Аленам (1877). А.п., як і *Бергмана правіла*, вынікае з прынцыпу паменшэння цепладдачы пры скарачэнні суадносін паверхні цела з аб'ёмам.

**Але́ндскі** Антон Варфаламеевіч (каля 1843, Люблінская губ. — 11.4.1864), удзельнік *паўстання 1863—64* на Беларусі. Скончыў 1-ы Маскоўскі кадэцкі корпус (1862), вучыўся ў Міхайлаўскай артыл. акадэміі (Пецярбург). Уваходзіў у афіцэрскую рэв. арг-цыю, зблізіўся з чл. арг-цыі *«Зямля і воля»*. У крас. 1863 выехаў з Пецярбурга ў Магілёўскі пав., дзе пад імем Антоній узначаліў Чарнаруцкі паўстанцкі атрад. Пасля разгрому атрада пад Славенямі (27 крас., цяпер Талачынскі р-н) далучыўся да сенненскіх, а потым барысаўскіх паўстанцаў. 13.5.1863 схоплены, публічна расстраляны ў Мінску. *Г.В.Кісялёў.*

**Але́невае во́зера**, Рэйндзір-Лейк (Reindeer Lake), возера ў Канадзе, у цэнтр. ч. Лаўрэнційскага ўзвышша, у катлавіне на выш. 350 м. Пл. 6,3 тыс. км$^2$, глыб. каля 60 м. Сцёк па р. Чэрчыл у Гудзонаў заліў.

**Але́невы грыб**, плютэй аленевы (Pluteus cervinus), шапкавы базідыяльны грыб з роду плютэй сям. мухаморавых. Пашыраны па ўсіх кантынентах, акрамя Антарктыды, у тундры — ласунак аленяў (адсюль назва). На Беларусі трапляецца ўсюды; расце на пнях і ламаччы розных дрэвавых парод.

Шапка дыям. 3—10 см, у маладых грыбоў званочкавая, потым распасцёртая. Мякаць белая, мяккая, з непрыемным пахам рэдзькі. Пласцінкі шырокія, частыя, белыя, потым ружаватыя ад спораў. Ядомы ў свежым, марынаваным, салёным выглядзе.

Аленевы грыб.

**Але́невы мох**, ягель, група лішайнікаў з родаў *кладонія, кладзіна*; асн. кармавая расліна паўн. аленяў.

**Але́невы рог**, гл. *Платыцэрыум.*

**Аленегадо́ўля**, галіна *жывёлагадоўлі*, якая займаецца развядзеннем і гасп. выкарыстаннем *аленяў*. Адрозніваюць А. паўночную і пантавую.

Паўночная А. — важнейшая галіна гаспадаркі Крайняй Поўначы, засяроджаная на развядзенні паўн. аленя (у паўн. шыротах Азіі, Еўропы — Расія, Фінляндыя, Швецыя, Нарвегія; у Паўн. Амерыцы — ЗША, Канада). У народаў тундравай зоны Сібіры пераважае мяса-скурная А., у больш паўд. раёнах — транспартная. Асн. прадукцыя паўн. А. — мяса 4—5-месячных цялят і дарослых аленяў і скуры, з якіх вырабляюць замшу, хром, цёплае адзенне, палаткі, лёгкія футры (пыжык, выпаратак і інш.). Ад самак за лактацыйны перыяд атрымліваюць 40—50 кг малака тлустасцю 17—19%. Пантавая А. займаецца развядзеннем плямістага аленя, марала і ізюбра для атрымання *пантаў*, мяса і скур. Да сярэдзіны 19 ст. панты здабывалі паляваннем на дзікіх аленяў. Пасля прыручэння маралаў і плямістых аленяў пантавая А. пашырылася ў Прыморскім, Алтайскім і Краснаярскім краях Расіі, дзе арганізаваны спец. гаспадаркі. Пантавых аленяў гадуюць таксама ў Кітаі, КНДР, Манголіі.

На Беларусі пантавая А. з'явілася ў канцы 1980-х г. Гадуюць плямістых аленяў і маралаў (у асобных гаспадарках Кобрынскага, Іўеўскага, Маладзечанскага і Пухавіцкага р-наў). Ад плямістых аленяў ва ўзросце 12—13 гадоў і маралаў 14—16 гадоў атрымліваюць лабавыя панты. Аленяў трымаюць на агароджаных участках; у стойлавы перыяд падкормліваюць сенам і канцэнтратамі. У пач. 1990-х г. у рэспубліцы налічвалася каля 1 тыс. галоў маралаў. *У.С.Маёраў.*

**Але́ні** (Cervidae), сямейства млекакормячых атр. парнакапытных. 5 падсям.: *кабарга*, мунтжакі (Cervulinae), вадзяныя А. (Hydropotinae), А. сапраўдныя (Cervinae) і амерыканскія А. (Odocoileinae). 17 сучасных родаў, каля 30 відаў. Пашыраны ў Еўразіі, Паўн. Афрыцы, Амерыцы. Акліматызаваны ў Новай Зеландыі, на Гавайскіх і некат. інш. астравах. На Беларусі *лось, казуля, лань* і *алень высакародны*.

**Але́нін** Аляксандр Аляксеевіч (13.6.1865, Разанская вобл. — 15.2.1944), кампазітар. Засл. дз. маст. РСФСР (1927). Кампазіцыі вучыўся ў А.*Лядава*. У 1923—24 уваходзіў у *Беларускую песенную камісію*. Збіраў і апрацоўваў рус. і бел. нар. песні. У творчасці (пераважна камерна-інстр. ансамблях, рамансах і песнях) апіраўся на муз. фальклор.

**А́лентаўн** (Allentown), горад на ПнУ ЗША, у штаце Пенсільванія, на р. Ліхай. Засн. ў 1762. 105 тыс. ж. (1990). Трансп. вузел. Выт-сць электроннага абсталявання, цяжкіх грузавых аўтамабіляў. Прыладабудаванне, металаапрацоўка. Тэкст., харч., паліграф. прам-сць.

**Але́нь Велікаро́гі**, гіганцкі алень, ірландскі алень (Megaloceros giganteus), вымерлая млекакормячая жывёла сям. аленевых атр. парнакапытных. Вядомы з сярэдняга і верхняга плейстацэну і ранняга галацэну Еўразіі і Паўн. Афрыкі. Асабліва многа шкілетаў знойдзена ў тарфяніках Ірландыі, на стаянках чалавека каменнага веку ў сярэдніх і паўд. шыротах, у т.л. ў Крыме і на Паўн. Каўказе, цэлыя шкілеты — на тэр. Разанскай і Екацярынбургскай абласцей Расіі. На Беларусі рэшткі А.в. выяўлены каля Смаргоні і в. Вейна (Магілёўскі р-н).

Буйная жывёла з вялізнымі (больш за 4 м у размаху) лапатападобнымі рагамі з некалькімі адросткамі. Вонкава нагадваў *лань*. Жыў на вільготных лугах па берагах рэк і балотаў, пазбягаў лясоў, у ледавіковыя эпохі адступаў на Пд.

**Але́нь высакаро́дны** (Cervus elaphus), млекакормячае з сям. аленяў атр.

парнакапытных. Пашыраны ў Еўразіі, Паўн. Афрыцы і Амерыцы. Мае шмат падвідаў, якія адрозніваюцца памерамі, рагамі і афарбоўкай (*марал*, ізюбр, вапіці і інш.). На Беларусі жыве ў мяшаных лясах з развітым падлескам паблізу вадаёмаў і лугоў Белавежскай і Налібоцкай пушчаў, Бярэзінскага запаведніка.

Даўж. цела да 2,6 м, выш. да 1,5 м, маса да 340 кг. Хвост кароткі. Рогі толькі ў самцоў (кожнай вясной скідаюць). Корміцца лісцем і парасткамі раслін, зімой — карой, пупышкамі і парасткамі. Палавая спеласць у 2 гады. Гон увосень. Цяжарнасць 8,5 мес. Ацёл у чэрв.—ліпені. Нараджае штогод 1, зрэдку 2 цяляці. Аб'ект промыслу і гадоўлі.

**АЛЕНЯВО́СТРАЎСКІ МО́ГІЛЬНІК**, могільнік канца *мезаліту* (канец 6 — пач. 5-га тыс. да н.э.) на в-ве Аленевым Анежскага возера (Карэлія). У 1936—38 даследавана 174 пахаванні, у якіх нябожчыкі пахаваны на спіне (118), на баку (11), скурчанымі (5) і вертыкальна (5). Знойдзена больш за 7 тыс. прадметаў, пераважна з косці і рогу: падвескі і пласцінкі (нашываліся на галаўны ўбор, шырокія паясы, адзенне і абутак), гарпуны, наканечнікі стрэл, кінжалы з крамянёвымі ўкладышамі, па-мастацку выразаныя фігуркі людзей, змей, галовы ласёў і інш.

**АЛЕ́ПА**, горад на ПнЗ Сірыі; гл. *Халеб*.

**АЛЕРГАЛО́ГІЯ** (ад *алергія* + *...логія*), раздзел *імуналогіі*, навука аб прычынах

Алені: 1 — плямісты; 2 — паўночны.

Алень велікарогі. Шкілет. Рэканструкцыя.

Алень высакародны.

узнікненні, механізмах развіцця, выяўленні, дыягностыцы і лячэнні алергічных рэакцый і *алергічных хвароб*. Падзяляецца на клінічную і эксперыментальную А. Асн. задачы А. — вывучэнне тыпаў алергічных рэакцый, аўтаалергій і распаўсюджвання розных *алергенаў* (пылавых, хім., бактэрыяльных і інш.) у навакольным асяроддзі і г.д.

Як навука ўзнікла ў рамках тэарэт. (паталаг. фізіялогія, мікрабіялогія) і клінічных (тэрапія, інфекцыйныя хваробы і інш.) дысцыплін. Першыя працы па А. з'явіліся на пач. 20 ст. Змену рэактыўнасці арганізма вывучалі франц. фізіёлагі Ш.Рышэ (увёў паняцце *анафілаксія*; 1902), М.Арцюс (упершыню атрымаў мясцовую анафілактычную рэакцыю; 1903), рус. вучоны Г.П.Сахараў (прапанаваў класічную мадэль вывучэння анафілаксіі; 1905), аўстр. ўрач К.Пірке (увёў паняцце *алергія*; 1906). У Расіі праблему даследавалі В.І.Малчанаў, П.С.Мядоўнікаў, А.М.Бязрэдка і інш.

Галава лася на рагавым стрыжні з Аленявостраўскага могільніка.

На Беларусі ў галіне А. ў 1920—60-я г. працавалі А.Я.Пракапчук, І.І.Багдановіч, А.П.Комаў і інш. (механізмы парушэнняў аўтаімунных працэсаў у арганізме), Я.Х.Кацман, А.С.Левін (алергічныя змены пры рэўматызме, гельмінтозах), Г.А.Калюжын (алергічныя рэакцыі ў дзяцей). Даследаванні па А. вядуцца ў Бел. ін-це ўдасканалення ўрачоў, НДІ гематалогіі і пераліванння крыві, сан.-гігіенічным ін-це, мед. ін-тах. Распрацаваны некаторыя пытанні прафілактыкі і лячэння сывараткавай хваробы і анафілактычнага шоку, анафілаксіі і дэсенсібілізацыі (В.В.Касмачэўскі), алергічныя дыягнастычныя рэакцыі для вызначэння цыстыцэркозу галаўнога мозга (І.П.Антонаў). У 1970—90-я г. вывучаюцца праблемы алергозаў прыроднага паходжання, бранхіяльнай астмы (Т.М.Сукаватых), медыкаментознай алергіі (Ю.Ф.Каралёў, С.А.Федаровіч), паствакцынальных алергічных энцэфалітаў і полірадыкуланеўрытаў (Д.А.Маркаў, А.Л.Леановіч), праф. алергозаў хім. этыялогіі (асабліва звязаных з вытворчасцю шкловалакна, ільновалакна і калійных угнаенняў). Распрацоўваюцца метады алергадыягностыкі і экспертызы алергеннай актыўнасці гаптэнаў.

*Літ.:* Адо А.Д. Общая аллергология. 2 изд. М., 1978; Фрадкин В.А. Аллергены. М., 1978; Новиков Д.К. Клиническая аллергология: Справ. пособие. Мн., 1991.




**АЛЕРГЕ́НЫ**, рэчывы, здольныя выклікаць *алергію*. Да іх адносяцца бялковыя і небялковыя (поліцукрыды) злучэнні, неарган. рэчывы, у тл. асобныя элементы (бром, ёд і інш.). Небялковыя рэчывы становяцца А. толькі пасля злучэння з бялкамі тканак арганізма Адрозніваюць эндаалергены (утвараюцца ў арганізме) і экзаалергены інфекц. і неінфекц. паходжання. Сярод А. інфекц. паходжання вылучаюць бактэрыяльныя, вірусныя і грыбковыя. Да неінфекц. адносяцца бытавыя (бытавы, бібліятэчны пыл і інш.), эпідэрмальныя (воўна, пер'е птушак, валасы, перхаць), інсектныя (яд, сліна кусачых, пыл з часцінак насякомых), лекавыя, пылковыя (раслінны пылок), прамысл.-хім. (бензол, шкіпінар, фарбавальнікі і інш.), харч. рэчывы. А. выклікае імуналагічна апасродкаваную адчувальнасць арганізма да яго (сенсібілізацыю). Ад першай дозы ў арганізме ўтвараюцца антыцелы, здольныя ўзаемадзейнічаць толькі з пэўным А. Паўторна трапляючы ў арганізм, А. злучаецца з раней утворанымі антыцеламі і выклікае алергічную рэакцыю.

*А.Ф.Сарока.*

**АЛЕРГІ́ЧНЫЯ ХВАРО́БЫ**, алергозы, група захворванняў, выкліканых імуннай рэакцыяй арганізма на экзагенныя (вонкавыя) *алергены*. Зале-

жаць ад умоў, якія спрыяюць уздзеянню алергена на арганізм, а таксама ад спадчыннай схільнасці арганізма рэагаваць на алергены (выпрацоўваць асобныя антыцелы — рэагіны). У развіцці А.х. стадыя сенсібілізацыі змяняецца стадыяй клінічных праяўленняў: ацёк слізістых абалонак, скуры, падскурнай клятчаткі, раздражненне нерв. канчаткаў, спазмы гладкай мускулатуры, гіперфункцыя экзакрынных залозаў; у крыві выяўляецца зазінафілія; характэрна абарачальнасць тканкавых змен. Пры агульных рэакцыях (анафілактычны шок) магчымы смяротны зыход. Да А.х. адносяцца: бранхіяльная астма, сенная ліхаманка, крапіўніца, ацёк Квінке, алергічны рыніт, атыпічны і кантактны дэрматыты, лек. і харч. алергія, сываратачная хвароба, анафілактычны шок. Асобную групу складаюць аўтаалергічныя хваробы (гл. *Аўтаалергія*). Метады лячэння спецыфічныя (спыненне кантактаў з алергенамі, выпрацоўка антыалергічнага імунітэту) і неспецыфічныя (лячэнне лек. прэпаратамі).

*Літ.:* Соколова Т.С., Рошаль Н.И. Аллергические заболевания. Л., 1990; Пыцкий В.И., Адрианова Н.В., Артомасова А.В. Аллергические заболевания. 2 изд. М., 1991. *М.Ф.Сарока.*

**АЛЕРГІ́Я** (ад *ала...* + грэч. ergon дзеянне), імунная рэакцыя арганізма да паўторнага ўздзеяння *алергенаў* з пашкоджаннем уласнай тканкі. Клінічныя праяўленні алергічных рэакцый бываюць неадкладныя і запаволеныя. Рэакцыі неадкладнага тыпу (скурныя і сістэмныя) узнікаюць праз 15—20 мін пасля ўздзеяння спецыфічнага А. пры анафілактычным шоку, крапіўніцы, сываратачнай хваробе, бранхіяльнай астме, сеннай ліхаманцы, ацёку Квінке. Рэакцыі запаволенага тыпу развіваюцца гадзінамі, іншы раз суткамі пры лекавым дэрматыце, вакцынацыях, інфекцыях (туберкулёз, дыфтэрыя і інш.). Адрозніваюць 3 стадыі развіцця А.: імуналагічную (алерген — цела), патахім. (вызваленне біял. актыўных рэчываў — медыятараў), патафізіял. (патагеннае ўздзеянне медыятараў на клеткі, органы і тканкі). Значная роля пры гэтым належыць спадчыннасці, стану эндакрынай і нерв. сістэм. Адсутнасць алергічнай рэакцыі на паўторна ўведзены алерген наз. анергіяй.

*Літ.:* Адо В. Аллергия. М., 1984; Аллергия: сто вопросов и ответов. М., 1988. *М.Ф.Сарока.*

**АЛЕ́СІ** (Alessi) Галеаца (1500 ці 1512, г. Перуджа — 30.12.1572), італьянскі архітэктар эпохі позняга Адраджэння. Вучыўся ў Рыме ў Мікеланджэла, працаваў у Генуі. Стварыў тып гар. палаца з разгорнутай углыбіню тэраснай кампазіцыяй, які ўзбагачаўся лесвіцамі і аркадамі: палац Пародзі ў Генуі (1567), палац Марына ў Мілане (пачаты ў 1557).

**«АЛЕ́СЯ»**, штомесячны грамадска-публіцыстычны і літаратурна-мастацкі часопіс для жанчын і сям'і. Выходзіць з ліст. 1924 у Мінску на бел. мове. Спачатку называўся «Беларуская работніца і сялянка», у 1931—41 «Работніца і калгасніца Беларусі», з 1946 «Работніца і сялянка», з 1995 сучасная назва. Асвятляе пытанні жыцця, працы, грамадскай дзейнасці жанчын Беларусі, папулярызуе пед. і юрыд. веды, дае парады, расказвае пра жыццё блізкага і далёкага замежжа.

**АЛЕ́УТЫ** (саманазва унанган), карэннае насельніцтва Алеуцкіх а-воў і п-ва Аляска. У ЗША 6 тыс. чал. (1983). Жывуць таксама на Камандорскіх а-вах (Расія, 700 чал., 1989). Гавораць на алеуцкай мове.

**АЛЕ́УЦКАЯ ДЭПРЭ́СІЯ**, вобласць нізкага атм. ціску над паўд. ч. Ціхага ак. з цэнтрам паблізу Алеуцкіх а-воў; адзін з цэнтраў дзеяння атмасферы. Праяўляецца пераважна зімой: ціск у цэнтры А.д. ў студз. ніжэй за 1000 гПа. Існаванне звязана з частым праходжаннем цыклонаў у гэтым раёне акіяна. Аналагічная *ісландскай дэпрэсіі* на Пн Атлантычнага акіяна.

**АЛЕ́УЦКАЯ ХВАРО́БА** норак, вірусны плазмацытоз, хранічная кантагіёзная вірусная хвароба норак і трусоў. Пашырана ў Паўн. Амерыцы і Еўропе. Узбуджальнік — ДНК-змяшчальны вірус, няўстойлівы ў вонкавым асяроддзі. Заражэнне адбываецца аліментарным, унутрывантробным шляхам і праз скуру пры ўкусах. Перадаецца праз кармы, прадметы догляду, мяса хворых жывёл. Прыкметы: прагрэсіўнае пахудзенне, крывацёк з носа і рота, смага, запаленне нырак і печані. У халодны перыяд смяротнасць звяроў да 90%. Імунітэт не выпрацоўваецца. Інкубацыйны перыяд ад 10—15 сутак да некалькіх месяцаў.

**АЛЕ́УЦКІ ЖО́ЛАБ**, глыбакаводны краявы жолаб у паўн. ч. Ціхага ак., уздоўж паўд. падводных схілаў Алеуцкіх а-воў. Даўж. больш за 4 тыс. км, сярэдняя шыр. больш за 60 км, глыб. да 7855 м. Грунт — чырв. гліны.

**АЛЕ́УЦКІ ХРЫБЕ́Т**, на п-ве Аляска, у Ціхаакіянскім поясе Кардыльераў Паўн. Амерыкі; тэр. ЗША. Даўж. каля 850 км. Ланцуг вулканічных конусаў выш. 2500—3000 м. Найб. вяршыня — г. Рэдаут (3108 м). 10 дзеючых вулканаў (Іліямна, Катмай, Паўлава і інш.). На схілах субарктычныя лугі, горная тундра. На вяршынях шматгадовыя снягі і ледавікі.

**АЛЕ́УЦКІЯ АСТРАВЫ́** (Aleutian Islands), архіпелаг на Пн Ціхага ак. (ЗША, штат Аляска). Дугападобны ланцуг са 110 астравоў і мноства скал (даўж. 1740 км) паміж п-авамі Аляска і Камчатка. Пл. 37,8 тыс. км$^2$. Нас. 7,5 тыс. чал. (1980) — алеуты, амерыканцы. Утвараюць 4 групы а-воў: Лісіныя, Андрыянаўскія, Пацучыныя, Блізкія. Большасць а-воў вулканічнага паходжання, вяршыні ўкрыты снягамі. Дзеючых вулканаў 25; самы высокі вулкан Шышалдзіна (2860 м) на в-ве Унімак. Клімат марскі субарктычны, вільготны. Зіма цёплая, са снегападамі і частымі адлігамі. Лета халаднаватае, з туманамі. Сярэдняя т-ра самага халоднага месяца (лютага) -1,4 °С, самага цёплага (жніўня) 11,9 °С. Ападкаў 1500 мм за год. Частыя штормы. Глебы субпалярныя, дзярнова-тарфяністыя і гарнатундравыя. Расліннасць: субарктычныя лугі, горныя тундры. Жывёльны свет: лісіца, марская выдра і сівуч (амаль знішчаны); на скалах птушыныя кірмашы, у прыбярэжных водах морж, цюлень і інш. Рыбалоўства. Пушны промысел. Зверагадоўля (блакітны пясец). Гал. населены пункт — Адак (на аднайм. в-ве). Ваенна-марская база ЗША Датч-Харбар (на в-ве Уналашка). Адкрыты ў 18 ст. рус. экспедыцыяй В.Берынга і А.Чырыкава. Да 1867 належалі Расіі, прададзены разам з Аляскай ЗША. *Р.А.Жмойдзяк.*

**АЛЕЎРАЛІ́Т** (ад *алеўрыт* + *...літ*), сцэментаваная асадкавая горная парода, складзеная больш як на 50% з часцінак алеўрытавых памераў (0,01—0,1 мм, гл. *Алеўрыт*). Адзін з асн. тыпаў пародасадкавай тоўшчы. Выкарыстоўваецца як сыравіна для вытв-сці цэменту і керамзіту.

**АЛЕЎРЫ́Т** (ад грэч. aleuron мука), рыхлая дробнаабломкавая асадкавая горная парода, паводле саставу прамежкавая паміж пяскамі і глінамі (пыл, глей, лёс і лёсападобныя пароды). Складаецца пераважна з мінер. зярнят (кварц, палявы шпат, слюда і інш.) памерам 0,01—0,1 мм. У залежнасці ад пераважных памераў вылучаюць буйна- і дробнаалеўрытавыя (тонкаалеўрытавыя) разнасці. А. выкарыстоўваюць у вытв-сці цэменту і буд. керамікі.

**АЛЕФІ́НЫ**, гл. *Алкены.*

**А́ЛЕЧСКІ ЛЕДАВІ́К** (Aletschgletscher), самы вялікі ледавік у Альпах, у Швейцарыі. Пл. 87 км$^2$. Даўж. 24,7 км. Далінны ледавік з прытокамі. Спускаецца з Бернскіх Альпаў на Пд і ПдЗ у даліну р. Рона да выш. 1520 м. Над А.л. узвышаюцца вяршыні Алечгорн, Юнгфрау і інш. Турызм (спец. чыгунка да выш. 3500 м, канатныя дарогі, атэлі і інш.).

**А́ЛЕШ** (Aleš) Мікалаш (18.11.1852, с. Міраціцэ, Чэхія — 10.7.1913), чэшскі жывапісец, графік. У 1875 скончыў АМ у Празе. Аўтар размалёўкі «Радзіма» (1880—81) у фае Нац. т-ра ў Празе, шматлікіх малюнкаў, у т.л. «Пяць пачуццяў» (1876), «Стыхія» (1881), цыкла «Жыццё старажытных славян» (1891); жывапісных работ: «Гусіцкі лагер», «На магіле ваяра-гусіта» (1877), «Сустрэча Іржы з Падэбрад з Мацвеем Корві-

ным», «Сутычка кавалерыстаў» (1878).
*Я.Ф.Шумейка.*

**АЛЕ́ША** Юрый Карлавіч (3.3.1899, г. Кіраваград, Украіна — 10.5.1960), рус. пісьменнік. У 1916—18 вучыўся ў Новарасійскім ун-це (Адэса). Аўтар рамана «Зайздрасць» (1927), рамана-казкі «Тры таўстуны» (1928; аднайм. фільм, 1967), кнігі апавяданняў «Вішнёвая костачка» (1931), мемуарна-дзённікавых запісаў «Ні дня без радка» (выд. 1961). Пісаў вершы, нарысы, кінасцэнарыі і інш. Інсцэніраваў для тэатра раман Ф.Дастаеўскага «Ідыёт».

*Тв.:* Избр. М., 1983; Бел. пер. — Зайздрасць. Мн., 1931.

**АЛЕ́ШКА** Антон Антонавіч (1.2.1913, в. Балочычы Слуцкага р-на Мінскай вобл. — 13.9.1971), бел. пісьменнік. Пасля педкурсаў пры Слуцкім пед. тэхнікуме (1931) настаўнічаў. Скончыў Ваенна-мед. акадэмію (1941). Служыў урачом у арміі. Друкаваўся з 1932. Выйшлі кн. аповесцяў і апавяданняў «Раніца» (1949), «Іх першых вітае сонца» (1957), «Пяць сутак» (1959), «Над намі мільён вышыні» (1965), раман «Дарогі без слядоў» (1969). Асн. тэма творчасці — жыццё і баявыя подзвігі лётчыкаў.

*Тв.:* Неба на замку. Мн., 1984.

**АЛЕ́ШНІКІ**, тое, што *альховыя лясы*.

**АЛЕ́ШНЯ**, рака ў Беларусі (Касцюковіцкі р-н Магілёўскай вобл.) і Расіі (Бранская вобл.), правы прыток Беседзі (бас. Дняпра). Даўж. 41 км, у межах Беларусі каля 15 км. Пл. вадазбору каля 280 км². Цячэ па Аршанска-Магілёўскай раўніне. У вярхоўі каналізаваная.

**АЛЕ́Я** (франц. allée), дарога ў парках, лесапарках, скверах, на бульварах, вуліцах, абапал абсаджаная дрэвамі або кустамі. Важны кампазіцыйны элемент паркавых ландшафтаў і азеляненння нас. пунктаў, выконвае ахоўныя функцыі. Тыпы А. — прамыя ў рэгулярных і крывалінейныя ў пейзажных парках і садах.

Для А. часцей выкарыстоўваюць высакарослыя і шыракакронавыя пароды (дуб звычайны, ліпа дрыбналістая, клён вастралісты, лістоўніца еўрапейская, граб звычайны, елка, вяз і інш.). Сярэдняя адлегласць паміж дрэвамі 5 м, паміж радамі 10 м. У прысадах часам ствараюць нішы для лавак, скульптуры малых арх. формаў.

**АЛЁКМА**, рака ў Расійскай Федэрацыі, у Чыцінскай і Амурскай абл. і Рэспубліцы Саха (Якуція), правы прыток Лены. Даўж. 1436 км, пл. бас. 210 тыс. км². Пачынаецца на паўн. схілах Алёкмінскага Станавіка, цячэ ў вузкай даліне з крутымі схіламі (рэчышча з перакатамі), далей — у глыбокай даліне прарыву паміж хрыбтамі Удакан і Станавы, мае 13 парогаў, непраходных для суднаў. На апошніх 410 км цячэ ў шырокай даліне па Сярэднесібірскім пласкагор'і (суднаходны ўчастак). Асн. прытокі Тунгір, Нюкжа (справа), Чара (злева). Жыўленне снегавое і дажджавое. Летам бурныя паводкі. Замярзае ў канцы кастр., крыгалом у маі, у нізоўях у чэрвені. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 2000 м³/с. Сплаўная ніжэй вусця р. Тунгір.

**АЛЁКМА-ЧА́РСКАЕ НАГО́Р'Е**, на У Забайкалля, у Рэспубліцы Саха (Якуція), у міжрэчны рэк Алёкма і Чара (бас. Лены). Выш. 500—600 м над узр. м., найб. да 1402 м. Пераважае сярэднягорны рэльеф. Расчлянёна глыбокімі далінамі. Вяршыні платападобныя. Складзена з вапнякоў, метамарфічных сланцаў, прарваных інтрузіямі гранітаў. На схілах лістоўнічныя лясы, зараснікі кедравага сланіку, на вяршынях горная тундра.

**АЛЁКМІНСКІ СТАНАВІ́К**, сістэма горных хрыбтоў на У Забайкалля, у Чыцінскай вобл. Рас. Федэрацыі. Складаецца з хрыбтоў Тунгірскага, Муройскага і інш. Даўж. каля 400 км. Выш. да 1908 м (г. Крапоткіна). Складзены ў асноўным з гранітаў. Пераважае рэльеф сярэднягор'я. Схілы (да выш. 1200 м)

Бярозавая алея ў Цэнтральным батанічным садзе АН Беларусі ў Мінску.

укрыты лістоўнічнымі лясамі, на вяршынях кедравы сланік, горная тундра, каменныя россыпы.

**АЛЁНКА**, бронзаўка касматая (Epicometis hirta), жук сям. пласцініставусых. Пашыраны ў Еўропе ад лясной зоны да гор Крыма і Каўказа.

Даўж. да 13 мм, цела матава-чорнае. Надкрылы з жаўтаватымі плямамі. Зверху густыя жоўта-шэрыя валаскі (адсюль другая назва). Лятае вясной і напачатку лета, жывіцца кветкамі і пупышкамі пераважна пладовых дрэў, а таксама злакамі. Зімуе ў глебе, вясной адкладвае 15—20 яец. Поўнасцю развіваецца за год. Шкодзіць дэкар. і пладовым раслінам.

**АЛЁХІН** Аляксандр Аляксандравіч (1.11.1892, Масква — 24.3.1946), рускі шахматыст, чэмпіён свету ў 1927—35 і 1937—46. Упершыню заваяваў тытул чэмпіёна ў матчы з Х.Р.*Капабланкам*, у другі раз — з М.*Эйве*, якому з 1935 на 2 гады ўступіў першынство. Пераможца буйных міжнар. турніраў, неперавзыдзены майстар гульні «ўсляпую». Аўтар прац па шахматнай тэорыі. У 1921 эмігрыраваў з Расіі, жыў у Парыжы.

**АЛЁХІН** Васіль Васілевіч (16.1.1882, г. Курск — 3.4.1946), савецкі геабатанік. Праф. (1918). Скончыў Маскоўскі ун-т (1907). Заснавальнік маскоўскай геабат. школы. З 1923 у Маскоўскім ун-це. Зрабіў вял. ўклад у вучэнне пра раслінныя згуртаванні — фітацэналогію. Прапанаваў класіфікацыю стэпаў, склаў аглядныя карты расліннасці розных раёнаў СССР.

*Тв.:* География растений. 3 изд. М., 1950;

Ю.К.Алеша.

А.А.Алёхін.

Растительность СССР в основных зонах. 2 изд. М., 1951.

**АЛЁХІН** Мікалай Аляксандравіч (н. 26.10.1954, Мінск), бел. спартсмен (фехтаванне на шаблях). Чэмпіён Алімпійскіх гульняў (1980, Масква), свету (1979, 1981) у камандным першынстве, уладальнік Кубка Еўропы (1982), чэмпіён СССР (1981, 1983).

**АЛЖЫ́Р**, Алжырская Народная Дэмакратычная Рэспубліка, АНДР (Аль-Джумхурыя аль-Джазаірыя Дэмакратыя аш-Шаабія), дзяржава ў Паўн. Афрыцы, у зах. ч. Міжземнаморскага басейна. Мяжуе з Марока і Зах. Сахарай (на З), Маўрытаніяй і Малі (на ПдЗ), Нігерам (на ПдУ), Лівіяй і Тунісам (на У). Пл. 2382 тыс. км². Нас. 27,9 млн. чал. (1994). Афіц. мова арабская, дзярж. рэлігія — іслам суніцкага кірунку. Сталіца — г. *Алжыр*. Падзяляецца на 48 вілаяў (правінцый). Нац. свята — Дзень Рэвалюцыі (1 ліст.).

**Дзяржаўны лад.** Паводле канстытуцыі 1989 А. — нар.-дэмакр. рэспубліка. Кіраўнік дзяржавы — прэзідэнт. У студз. 1992 сфарміраваны Вышэйшы дзярж. савет (ВДзС), на які ўскладзены функцыі калект. прэзідэнта. У сувязі з роспускам Нац. нар. сходу (парламента) ВДзС надзелены правам выдаваць дэкрэты, якія маюць сілу законаў. У лют. 1992 створаны Нац. кансультатыўны савет, закліканы «дапамагаць ВДзС у ажыццяўленні яго функцый, ствараць неабходныя ўмовы для нармальнага функцыянавання ўстаноў і канстытуцыйнага ладу».

**Прырода.** Краіна невысокіх гор і ўзвышаных раўнін. На Пн хрыбты Атласкай горнай сістэмы, у межах якой вылучаюць горны ланцуг Толь-Атлас (масіў Варсеніс, выш. да 1995 м), ма-

сівы Вял. і Малой Кабілії (выш. да 2308 м), Сахарскі Атлас (масівы Ходна, Арэс, выш. да 2328 м). Паміж імі міжгорныя пласкагор'і і раўніны Высокіх плато (800—1200 м). У цэнтр. іх частцы вял. салёныя азёры (себхі). Поўдзень А. займае 1/4 частку пустыні Сахара. Пераважаюць камяністыя плато (выш. каля 500 м) і пясчаныя пустынныя вобласці — эргі з высокімі дзюннымі градамі (В. Зах. Эрг, В. Усх. Эрг, Эрг Ігіды, Эрг Шэш і інш.), камяністыя пустыні-хамады (Танезруфт на Пд). На Пд Алжырскай Сахары пустыннае нагор'е Ахагар з вяршыняй Тахат (3003 м, найвышэйшая ў краіне). Нетры А. багатыя нафтай, прыродным газам (па запасах нафты 3-е, газу 1-е месца ў Афрыцы, б.ч. радовішчаў на ПнУ Алжырскай Сахары), рудамі ртуці, цынку, свінцу, жалеза, урану, сурмы, фасфарытамі, ёсць медзь, волава, вальфрам, золата, каменны вугаль і інш. Клімат паўн. А. субтрапічны міжземнаморскі, сярэдняя т-ра студз. 5—12 °С, ліп. 25 °С, ападкаў у гарах 1200 м (Кабілія), на міжгорных раўнінах 200—400 мм. Клімат Алжырскай Сахары пустынны, трапічны, сутачныя ваганні т-р да 30 °С, ападкаў менш як 50 мм за год, у асобныя гады не бывае зусім. Часты пясчаныя буры. Большасць рэк належаць да тыпу вадзі, якія запаўняюцца вадой пасля рэдкіх дажджоў. Самая вял. р. Шэліф (Вадзі). Рэкі часткова выкарыстоўваюцца на арашэнне і для атрымання гідраэнергіі. У пустынных раёнах на арашэнне і водазабеспячэнне ідуць падземныя воды. На ўзбярэжжы міжземнаморскі тып расліннасці з цвердалістых хмызнякоў і нізкарослых дрэў. На Пн у гарах да выш. 800 м растуць сухалістыя хмызнякі (макві), да 1500 м — коркавы і каменны дубы, вышэй за 1500 м — туя і ядловец. У Сахары расліннасць пустынная і паўпустынная, месцамі салянкі, эфемеры, трава альфа, асобныя хмызнякі; вял. прасторы без расліннасці. Глебы на ўзбярэжжы карычневыя і шэра-карычневыя, у горных раёнах лясныя бурazёмы, вакол салёных азёраў (шотаў) — алювіяльныя і засоленыя. У Сахары прымітыўныя глебы пустыні. Жывёльны свет на Пн амаль знішчаны. У Сахары грызуны, паўзуны, шакалы, газелі, антылопы і інш. Нац. паркі: Джурджура, Акфаду, Тасілін-Аджэр і інш.

**Насельніцтва**. Жывуць арабы (80%), берберы (каля 20%; кабілы шаўіі, туарэгі і інш.), невял. колькасць французаў, італьянцаў, іспанцаў. Натуральны прырост 30 чал. на 1 тыс. за год. Сярэдняя шчыльн. 11,6 чал. на 1 км² (1994). Больш за 95% насельніцтва сканцэнтравана ў паўн. А., дзе яго шчыльн. 300 чал. на 1 км²; у пустынных абласцях каля 0,3 чал. на 1 км². Гар. насельніцтва больш за 50% (1994). Найб. гарады: Алжыр, Аран, Канстанціна, Анаба, Сетыф, Бліда, Тызі-Узу, Эш-Шэліф.

Сярэдняя працягласць жыцця мужчын 59, жанчын 62 гады. Узровень нараджальнасці 32 на 1 тыс. чал. Дзіцячая смяротнасць 58 на 1 тыс. нованароджаных (1994).

**Гісторыя**. Сляды першабытнага чалавека на тэр. А. адносяцца да ніжняга і сярэдняга палеаліту (300—400 тыс. г. назад). З эпохі верхняга палеаліту тут зафіксаваны носьбіты астэрыйскай, ібера-маўрусійскай і капсійскай археал. культур. З пераходам да неаліту (4-е тыс. да н.э.) «капсійцы» выцеснілі ібера-маўрусійцаў. У канцы 12 ст. да н.э. на ўзбярэжжы А. з'явіліся *фінікійцы*, якія ў 8 ст. да н.э. трапілі пад уладу *Карфагена*. На мяжы 3—2 ст. да н.э. на тэр. А. ўтворана дзяржава *Нумідыя*. Канфлікт з Рымам прывёў да ўключэння Нумідыі ў склад Рымскай імперыі. У 439 н.э. Карфаген захапілі *вандалы* і зрабілі

Герб і сцяг Алжыра.

яго сталіцай свайго каралеўства. З 534 Вандальскае каралеўства пад уладай Візантыі; яго ўнутраныя раёны кантралявалі плямёны *берберaў*, якія стварылі шэраг незалежных дзяржаў. У канцы 7 ст. н.э. тэр. А. заваявалі арабы-мусульмане і ўключылі яе ў склад Арабскага халіфата. Карэнныя берберскія плямёны паступова прынялі іслам і араб. мову, што вызначыла іх як араба-ісламскую краіну. З 16 ст. А. у складзе *Асманскай імперыі*, залежнасць ад якой у 17 ст. стала фармальнай; на чале А. быў правіцель — дэй, якога выбіралі са свайго асяроддзя янычарскія камандзіры. У гэты час акрэсліліся граніцы А., якія размежавалі яго з Тунісам і Марока. У 18 — пач. 19 ст. А. прыйшоў у заняпад, што дало магчымасць у 1830 франц. войскам захапіць г. Алжыр. У 1832—47 вызв. барацьбу алж. народа супраць франц. панавання ўзначаліў эмір *Абд аль-Кадзір*. У антыкаланіяльным *Мукрані паўстанні 1871—72* удзельнічала каля 800 тыс. чал. Найбольшы размах антыкалапіяльны рух набыў пасля 2-й сусв. вайны. У маі 1945 паўстанне ва Усх. А. жорстка задушана. У 1946 засн. партыя Рух за перамогу дэмакр. свабод, якая ўзначаліла ба-



рацьбу супраць калан. рэжыму. Створаны ёю Рэв. к-т адзінства і дзеянняў (з 1954 *Фронт нацыянальнага вызвалення*, ФНВ) пачаў узбр. барацьбу, стварыў Армію нац. вызвалення; 1.11.1954 адначасова ў 30 пунктах краіны пачалося ўзбр. паўстанне. У 1955—56 амаль усе нацыяналіст. партыі і арг-цыі ўліліся ў ФНВ. Вызваленчая вайна скончылася *Эвіянскім пагадненнем 1962* аб самавызначэнні А. 5.7.1962 абвешчана незалежная дзяржава. Першы прэзідэнт А.*Бен Бела* абвясціў праграму «алжырскага сацыялізму». Была нацыяналізавана ўласнасць еўрап. уладальнікаў, пануючае становішча ў эканоміцы заняў дзярж. сектар. У выніку ваен. перавароту 19.6.1965 улада перайшла да Рэв. савета на чале з Х.*Бумедзьенам*. Канстытуцыя 1976 замацавала сацыяліст. арыентацыю А. Новы прэзідэнт Ш.Бенджадзід (з 1979) прадоўжыў курс папярэдніка. Эканам. крызіс 1980-х г. і дэмаграфічны выбух (у 1966—87 насельніцтва А. павялічылася з 12 да 23 млн. чал.) абвастрылі сац. напружанасць і прывялі да масавых беспарадкаў. З канца 1988 кіраўніцтва А. пачало радыкальныя змены ў эканам. і паліт. сістэме А., узяло курс на развіццё рыначнай эканомікі. Гэтыя змены замацавала канстытуцыя 1989. Уведзена шматпартыйнасць, з'явілася больш за 50 партый і грамадскіх арг-цый. На першых выбарах у органы мясц. улады, якія адбыліся на шматпарт. аснове 12.6.1990, перамаглі фундаменталісты Ісламскага фронту выратавання (ІФВ). Іх праграма прадугледжвала датэрміновыя выбары ў Нац. нар. сход (парламент), умацаванне ў грамадска-паліт. жыцці нормаў шарыяту, фарміраванне «Ісламскага грамадства». У 1-м туры парламенцкіх выбараў 1991 перамаглі ісламісты. У 1992 прэзідэнт Бенджадзід вымушана пайшоў у адстаўку. Улада перайшла да Вышэйшага дзярж. савета. Прэзідэнтам стаў М. Буджаф; парламент распушчаны, і ўведзены рэжым надзвычайнага становішча. У сак. 1992 распушчаны ІФВ. У чэрв. 1992 прэзідэнт Буджаф забіты, яго змяніў А.Кафі. Тэрарыстычныя акты, арганізаваныя фундаменталістамі, вымусілі ўлады прадоўжыць (лют. 1993) рэжым надзвычайнага становішча на неакрэслены тэрмін. Прэзідэнт А. (з 1994) Л.Зераль. А. — член ААН (1962), Лігі арабскіх краін і інш. міжнар. арг-цый.

**Палітычныя партыі і грамадскія арганізацыі**. Фронт сацыяліст. сіл, Аб'яднанне за культуру і дэмакратыю, Хамас, Ан-Нахда і інш.; Усеагульны саюз алжырскіх працоўных, Нац. саюз алжырскіх сялян, Нац. саюз алжырскай моладзі, Нац. саюз алжырскіх жанчын, Нац. арг-цыя муджахідаў і інш.

**Гаспадарка**. Пасля атрымання незалежнасці для А. характэрны высокі ўзровень нацыяналізацыі прыродных рэсурсаў, прам-сці, транспарту, фінансаў і інш. З канца 1980-х г. пачаліся рэформы і перавод гаспадаркі на рыначную аснову. Валавы ўнутраны прадукт (ВУП) 40,5 млрд. дол. (1991). Вядучая галіна прам-сці — здабыча нафты (41 млн. т, 1992) і прыроднага газу (126,61 млрд. м$^3$). Здабываюцца руды каляровых металаў, жал. руда, фасфарыты, барыты, сурма. Апрацоўчая прам-сць: чорная металургія (металург. комплекс у Анабе), машынабудаванне (вытв-сць халадзільнікаў, тэлевізараў, радыёпрыёмнікаў, трактароў і аўтамабіляў), нафтаперапрацоўка, электратэхн., транспартнае абсталяванне, вытв-сць мінер. угнаенняў, буд. матэрыялаў. Перапрацоўка с.-г. сыравіны: мукамольныя, вінаробныя, масларобныя, кансервавыя, тытунёвыя прадпрыемствы. Развіта тэкстыльная, швейная, нафтахім. прам-сць (сінт. смолы, пластмасы, мыйныя сродкі). Вытв-сць электраэнергіі 16,8 млн. кВт·гадз (1992). Сельская гаспадарка дае больш за 8% ВУП. Асн. культуры: пшаніца, ячмень, вінаград, алівы, цытрусавыя, фінікі, міндаль, кукуруза, тытунь, бавоўнік; у аазісах — фінікавыя пальмы, на ўзбярэжжы і каля буйных гарадоў — гародніна (часткова на экспарт) і бульба. Нарыхтоўваюць кару коркавага дуба і траву альфа (сыравіна для вытв-сці высакаякаснай паперы, каля 100 тыс. т за год). Жывёлагадоўля пераважна экстэнсіўнага кірунку. У пустынных горных раёнах гадуюць авечак, козаў, вярблюдаў, на Пн краіны і каля вял. гарадоў — буйн. раг. жывёлу. У прыбярэжных водах марское рыбалоўства. На Пн А. густая сетка шашэйных дарог — 130 тыс. км (1989), у т.л. з цвёрдым пакрыццём больш за 50 тыс. км; дзейнічае транссахарская шашэйная дарога. Чыгункі 4,2 тыс. км (1989). У А. буйныя нафта- і газаправоды. Разам з Італіяй пабудаваны трансміжземнаморскі газаправод. Гал. парты: Беджаія, Алжыр, Арзеу, Аран, Анаба. Асн. прадукты экспарту — нафта і нафтапрадукты, звадкаваны газ, віно, цытрусавыя, жал. руда, мінер. сыравіна, тытунь. У імпарце пераважаюць машыны і абсталяванне, прадукты і спажывецкія тавары. Асн. гандлёвыя партнёры — Францыя, Германія, Італія, Іспанія, ЗША, Японія (каля 80% тавараабароту). Грашовая адзінка — алжырскі дынар.

Алжыр. У гарах Кабілії.

**Узброеныя сілы** А.: нац. нар. армія, нац. жандармерыя, рэсп. і прэзідэнцкая гвардыя; ёсць паўваен. фарміраванні грамадз. абароны і нац. службы. Вярх. галоўнакамандуючы — прэзідэнт. У склад нац. нар. арміі ўваходзяць сухапутныя войскі (аснова ўзбр. сіл), ВПС (складаюцца з авіяэскадрыллі) і ППА (зенітныя брыгады і дывізіёны, радыётэхн. войскі), ВМС (падводныя лодкі, караблі, катэры розных класаў). Узбр. сілы камплектуюцца паводле закона аб усеаг. воінскай павіннасці, набор ажыццяўляецца 2 разы на год, прызыўны ўзрост 19—27 гадоў, тэрмін абавязковай ваен. службы 1,5 года. Афіцэрскія кадры рыхтуюць у агульнавайсковай акадэміі, ваен. вучылішчах і за мяжой.

**Асвета, навуковыя і культурна-асветныя ўстановы**. Сістэма адукацыі А. склалася ў выніку рэформаў 1970-х г. (ВНУ), 1980 (пач. школа) і 1984 (сярэдняя школа). Агульную адукацыю (абавязковая для дзяцей 6—16 гадоў) даюць базавыя школы (9 гадоў навучання). Лепшых вучняў адбіраюць для агульных або тэхн. (паводле профілю спецыялізацыі) ліцэяў (поўны курс сярэдняй адукацыі да 13 гадоў навучання). У 1987/88 навуч. г. ў А. працавала 14 тыс. базавых школ (больш за 5 млн. вучняў), 600 сярэдніх навуч. устаноў (600 тыс. навучэнцаў), 700 цэнтраў прафес. падрыхтоўкі, у сістэме прафес. навучання 250

Да арт. Алжыр. Цэнтральная частка горада Эль-Уэд.

тыс. чал. У сістэме вышэйшай адукацыі 20 ун-таў і універсітэцкіх цэнтраў, каля 30 ін-таў і інш. ВНУ. Найбуйнейшыя: Алжырскі ун-т (засн. ў 1879) з філіяламі ў Аране і Канстанціне, ун-т прыродазнаўчых навук і тэхналогіі, нац. ін-ты нафты, газу і хіміі; лёгкай прам-сці; аграномічны, вышэйшая вет. школа і інш. У 1987/88 навуч. г. ў ВНУ каля 150 тыс. чал., больш за 12 тыс. выкладчыкаў. Самыя вял. б-кі: Нац. б-ка, б-ка ун-та ў Алжыры, Муніцыпальная б-ка ў Канстанціне. Музеі: Нац. музей А., Нац. музей прыгожых мастацтваў, Нац. музей антычнасці, этнаграфічны, Музей нац. вызвалення. Навук. даследаванні ў галіне ядз. фізікі, электронікі, акіянаграфіі, біялогіі, біяхіміі, ветэрынарыі, сельскай гаспадаркі вядуцца ва ун-тах і НДІ; мед. праблемы даследуюць анкалагічны цэнтр, ін-т Пастэра, ін-т гігіены, сетка доследна-селекцыйных станцый. Працуюць астранамічная, астрафізічная і метэаралагічная абсерваторыі.

**Друк, радыё, тэлебачанне**. У А. больш за 150 перыяд. выданняў (агульны тыраж каля 1,7 млн. экз.). Афіцыйны орган урада — газета «El Moudjahid» («Змагар»). Дзярж. інфарм. агенцтва Альжэры Прэс Сервіс (з 1962, г. Алжыр). Нац. тэлерадыёкампанія «Радыётэлевізьён альжэр'ен» (з 1962) вядзе перадачы на араб., франц. і кабільскай мовах. Тэлецэнтр у г. Алжыр.

**Літаратура**. Развіваецца на арабскай, кабільскай і франц. мовах. Літаратура на арабскай і кабільскай мовах узнікла ў 16—18 ст. у эпоху барацьбы супраць ісп. экспансіі і тур. панавання, калі духоўнае жыццё краіны выяўлялася пераважна ў вуснай нар. творчасці. У 19 ст. л-ра адлюстроўвала працэс фарміравання алж. нацыі. Нар. паэты (медахі) заклікалі да супраціўлення франц. каланізатарам. Патрыят. паэзія Абд аль-Кадзіра, Саіда Абдалаха, Мухамеда Белькаіра і паэта Кабілії Сі Маханда блізкая па духу да нар. песень. Нац.-вызв. барацьба — гал. тэма ў паэзіі 1950—60-х г. (вершы Абу аль-Касіма Саадала, Муфдзі Закарыя, аўтара нац. гімна) і прозы (ат-Тахір Ватар, Фадзіля Масудзі). Пачынальнік жанру апавядання і аўтар першага алж. рамана на араб. мове — Ахмед Рыда-Хуху («Дзяўчына з Меккі», 1947). У 1967 з'явіўся раман Мухамеда Мані «Голас кахання». Пра жыццё краіны ў 1970-я г. раманы Ватара («Землетрасенне»), Абд аль-Хаміда Бенхедугі («Вецер з поўдня» і «Канец учарашняга дня») і інш. Літаратура на французскай мове пачала развівацца ў 1940—50-я г. Абуджэнне нац. самасвядомасці алжырцаў паказалі празаік Жан Амруш, паэты Аіт Джафер, Мустафа Лашраф, рэаліст. творы Мухамеда Дыба (трылогія «Алжыр»), Мулуда Ферауна (раманы «Сын бедняка» і «Дарога ў гару», дылогія «Зямля і кроў»), Мулуда Мамеры (раманы «Забыты пагорак», «Калі спіць справядлівасць»), Малека Уары (раман «Зернетка ў жорнах») і інш. Пра алж. інтэлігенцыю ў час нац.-вызв. вайны раманы Малека Хадада «Апошняе ўражанне» і «Набярэжная кветак не адказвае». Стварэнне незалежнай рэспублікі ў 1962 адкрыла новую эпоху ў л-ры А.: раманы Мурада Бурбуна «Муэдзін», Рашыда Буджэдры «Адрынутасць», Асіі Джэбар «Наіўныя жаваранкі». Вяршыня рэаліст. л-ры А. гэтага часу — раман Мамеры пра нац.-вызв. вайну «Опіум і дубінка». Укладам у алж. л-ру 1960—80-х г. стала творчасць Мулуда Ашура, Джамаля Амрані, Кадура М'Хамсаджы, Ахмеда Акаша, Мустафы Тумі, Набіля Фарэса, Айшы Лемсін, Джамаля Алі Хаджы, Мустафы Хасіяна і інш.

Да арт. Алжыр. Наскальныя малюнкі ў Тасілін-Аджэры.

Наскальныя выявы ў Тасілі на поўдні Алжыра.

**Архітэктура і выяўленчае мастацтва**. Найб. старажытныя помнікі мастацтва на тэр. А. адносяцца да неаліту (наскальныя выявы жывёл, людзей, сцэны палявання і рытуальных абрадаў у гарах Тасілін-Аджэр, Тасілін-Ахагар). Захаваліся рэшткі гарадоў часоў фінікійскага, рымскага і візантыйскага панавання: Джэміла, Гіпон, Тымгад, Тыпаса, Шэршэль з руінамі ўмацаванняў, храмаў, тэатраў, тэрмаў, трыумфальных арак, акведукаў, жылых дамоў. Пры раскопках выяўлены творы скульптуры, мазаікі з міфалаг. і быт. сцэн. Пасля араб. заваявання ў гарадах будаваліся ўмацаванні, мячэці, медрэсэ, лазні, рынкі, палацы (г. Кала-Бені-Хамад, 11 ст.). У 10—13 ст. у гарадах Алжыр, Тлемсен, Канстанціна ўзведзены мячэці, вежы-мінарэты, палацы, грамадскія будынкі, арнаментаваныя разьбой па стука, кафляй. Дойлідства і дэкар.-прыкладное мастацтва А. 16—18 ст. вызначаліся пышнасцю, багаццем формаў і разнастайнасцю арнаментыкі (палацы і вілы тур. намеснікаў). Гараджане жылі ў невял. 2—3-павярховых дамах з плоскімі дахамі, з замкнёнымі дворыкамі. У 1881 у г. Алжыр засн. Нац. школа архітэктуры і прыгожых мастацтваў. З 1930-х г. у А. працавалі франц. архітэктары і інжынеры Ле Карбюзье, П.А.Эмеры, Б.Зерфюс, Л.Мікель, П.Турнон. У гарадах узводзіліся шматпавярховыя жылыя і адм. будынкі, вілы, асабнякі, набліжаныя да еўрап. архітэктуры. Дэкар.-прыкладное мастацтва прадстаўлена тканінамі, дыванамі, вышыўкай, размаляванай керамікай, вырабамі рамеснікаў. У выяўл. мастацтве 19 — пач. 20 ст. працавалі пераважна франц. мастакі, з 1920—30-х г. — мастакі-алжырцы (Мухамед і Амар Расім, Тэмам Ранем і інш.), з сярэдзіны 20 ст. — жывапісцы, графікі, скульптары (Х.Бенанбур, М.Будзід, І.Самсом, М.Адан,

Горад Алжыр.

М.Хада, Ш.Меслі і інш.). У маст. жыцці сучаснага А. вядучую ролю адыгрывае Нац. саюз работнікаў выяўл. мастацтва.

**Музыка** А. мае шмат агульнага з музыкай Туніса, Марока, інш. краін рэгіёна. У ёй спалучаюцца араба-іранскія і турэцкія элементы з муз. традыцыямі лакальных этнасаў А. (берберы, туарэгі, негрскія народы Сахары). Арабская класічная музыка А. засн. на дасягненнях т.зв. зах. (андалузскай) школы. Асн. яе форма — алжырская нуба, разгорнутая 5-часткавая вак.-інстр. кампазіцыя з інстр. уверцюрай (тушыя); у аснове муз. развіцця рэгіянальныя разнавіднасці макамаў (вак.-інстр. цыклічная форма, засн. на шэрагу ладоў-макамаў). Сярод муз. інструментаў — уд (арабская лютня), рэбаб (струнны смычковы), канун (72-струнная цытра), духавыя, ударныя (бубны дэф і тар, барабан дарабука). З вак. жанраў вядомы касыды. З пач. 20 ст. развіваюцца формы сучаснай гар. музыкі — песенны жанр аль-джад (сярод майстроў кампазітар і спявак Хадж Мухамед аль-Анка) і муз. драма ў стылі аль-джад («Фако», «Дар Бібі» М.Бахтарзі). Муз. кадры ў А. рыхтуюць вышэйшыя і сярэднія муз. навуч. ўстановы, кансерваторыя музыкі і дэкламацыі (з 1920) і Нац. ін-т музыкі.

**Тэатр.** Нац. тэатр у А. існаваў у выглядзе выступленняў «гаўалі» (апавядальнікаў) і ценявога т-ра з удзелам Гарагуза (алж. Пятрушкі). У сучасных формах т-р узнік у канцы 19 — пач. 20 ст. Пасля 1-й сусв. вайны першую тэатр. трупу арганізаваў Р.Ксенціні. Справу яго прадоўжыў драматург Б.Махіддзін. У рэпертуары былі п'есы алж. драматургаў, зах.-еўрап. класікаў. З пачаткам вызв. вайны (1954) многія акцёры пакінулі радзіму і стварылі за мяжой (у Тунісе) алж. маст. ансамбль, на базе якога пасля абвяшчэння незалежнасці А. ў 1962 створаны Алжырскі нац. т-р (з 1963 у г. Алжыр).

**Кіно.** Нац. кінематаграфія ў А. зарадзілася ў перыяд вызв. вайны 1954—62. Пасля 1962 вытворчасць хранік.-дакумент. фільмаў павялічылася, зняты першыя маст. фільмы на фальклор.-этнагр. сюжэты ці прысвечаныя падзеям вайны 1954—62. У 1964 створаны нац. цэнтр кінематаграфіі, у 1974 — Савет аўдыёвізуальных мастацтваў (прафсаюз работнікаў кіно і тэлебачання). Сярод лепшых фільмаў 1970—80-х г.: «Бітва за Алжыр», «Вецер з Арэса», «Хроніка вогненных гадоў», «Амар Гатлата», «Анатомія адной змовы». Вядучыя рэжысёры: М. аль-Ахдар Хаміна, А.А.Тульбі, М.Алуаш, М.Буамары, М.С.Рыяд, А.Рашдзі.

*Літ.:* Алжир: (справ.). М., 1977; Ланда Р.Г. Кризис колониального режима в Алжире, 1931—1954. М., 1980; Ягож. История алжирской революции, 1954—62. М., 1983.

*П.І.Рогач* (прырода, гаспадарка), *У.С.Кошалеў* (гісторыя), *Б.А.Лазука* (выяўл. мастацтва), *А.М.Гарахавік* (музыка).

**АЛЖЫ́Р** (араб. Аль-Джазаір), горад, сталіца *Алжыра*. Адм. ц. вілаі Алжыр. З прыгарадамі — Вялікі А. (Алжырская агламерацыя), 2,5 млн. ж. (1990). Трансп. вузел. Буйны порт на Міжземным м. Міжнар. аэрапорт. Галоўны эканам., навук. і культ. цэнтр. Маш.-буд., тэкст., харчасмакавая, хім., нафтаперапр., цэментная прам-сць. Метрапалітэн. Ун-т.



Да арт. **Алжыр**. Плато Тасілін-Аджэр.

Засн. ў 10 ст. на руінах невял. рым. порта Ікозіум. Назва ад араб. слова «аль-джазаір» (астравы). Хутка стаў важным гандл. цэнтрам на Міжземным моры. Да пач. 16 ст. ўваходзіў у араба-берберскія дзяржавы *Фатымідаў, Альмаравідаў, Альмахадаў*, Заянідаў. У 1510 заняты іспанцамі. У 1530 грэка-тур. карсары выгналі іспанцаў, захапілі ўладу і перайшлі пад апеку *Асманскай імперыі*. У 1830—62 адм. ц. франц. калоніі Алжыр. У час 2-й сусв. вайны ў А. штаб-кватэра саюзнага камандавання на Міжземным м. З 1962 сталіца Алжыра.

Размешчаны амфітэатрам на зах. беразе Алжырскага заліва каля падножжа і па схілах узгоркаў. Шмат садоў і паркаў. У старым горадзе (з 1978 музей-запаведнік) захаваліся касба-крэпасць (тур. часу), Вял. мячэць (1096) з мінарэтам (1323), мячэць-усыпальніца Сідзі Абдарахман (1611), мячэць Джамі аль-Джэдзід (мячэць Рыбакоў, 1660); палацы Дар Азіза (1551) і Мустафа-пашы (1799—1800); віла Бардо (18 ст., цяпер Музей першабытнай гісторыі і этнаграфіі).

У новым горадзе (развіваўся ў 19 ст. на ПдЗ ад сярэдневяковага) Дом урада (1930, арх. Ж.Гёшэн, А. і Г. Перэ), Палац нацый (1965, арх. Мустафа Муса), Дом радыё і тэлебачання (1950-я г., арх. П.Турнон і М.Жалі) і інш. Працуе Нац. музей прыгожых мастацтваў.

**АЛЖЫ́РА-ТУНІ́СКІ АРТЭЗІЯ́НСКІ БАСЕ́ЙН**, гл. *Вялікі сахарскі артэзіянскі басейн*.

**АЛЖЫ́РСКІЯ АРА́БЫ**, нацыя, асн. насельніцтва *Алжыра* (больш за 19 млн. чал.). Агульная колькасць 19,88 млн. чал. (1987). Гавораць на *арабскай мове*.

**АЛІ́** (Ali) Махамед [сапр. Клей (Clay) Касіус; н. 17.1.1942, г. Луісвіл, штат Кентукі, ЗША], амерыканскі спартсмен (бокс). Чэмпіён Алімпійскіх гульняў (1960, Рым) у паўцяжкай вазе. На прафес. рынгу з 1961. Абсалютны чэмпіён свету сярод прафесіяналаў у цяжкай вазе (1964); 9 разоў адстойваў гэта званне. За адмову ваяваць у В'етнаме ў 1968 пазбаўлены чэмпіёнскага тытула. У 1974 і 1978 вяртаў званне абс. чэмпіёна свету. Удзельнік руху за грамадзянскія правы неграў.

**А́ЛІ ІБН АБІ́ ТА́ЛІБ** (604 ?, Мекка — 24.1.661), чацвёрты праведны халіф [656—661], стрыечны брат і зяць прарока *Мухамеда*; адзін з першых паслядоўнікаў і сакратар прарока; духоўны галава *шыітаў*. Абвешчаны халіфам у *Медыне* пасля забойства яго папярэдніка *Асмана*. У «вярблюджай бітве» пад

Да арт. **Алжыр**. Трыумфальная арка Траяна ў г. Тымгад. Канец 2 ст.

Басрай (снеж. 65б) разбіў асн. сілы працаўніка. У 657 з-за нерашучасці ў барацьбе з сірыйскім намеснікам Муавіяй 12 тыс. воінаў, якія сталі звацца *харыджытамі*, пакінулі, а пазней забілі А.

**АЛІ́-БАЙРАМЛЫ́**, горад у Азербайджане, на Шырванскай раўніне, прыстань на р. Кура. 51 тыс. ж. (1987). Чыг. станцыя. Машынабудаванне (выт-сць прыстасаванняў аўтам. кіравання быт. прыладамі), хім., тэкст. і харчасмакавая прам-сць. У раёне А.-Б. здабыча нафты.

**АЛІБЕ́ГАЎ** Іван Якаўлевіч (сапр. Алібегянц Аганез Акопавіч; 3.12.1886, г. Кутаісі — 1941), дзярж. і паліт. дзеяч Беларусі. З 1915 у Мінску, стваraў бальшавіцкія арг-цыі ў войсках Зах. фронту. Пасля Люг. рэвалюцыі 1917 чл. выканкома Мінскага Савета, з вер. 1917 старшыня Мінскага к-та РСДРП(б). На I і II Паўн.-Зах. абл. канферэнцыях РСДРП(б) выбраны нам. старшыні абл. к-та. З ліст. 1917 сакратар Прэзідыума Аблвыкамзаха, камісар працы Зах. вобласці. У 1918 нам. старшыні Паўн.-Зах. к-та РКП(б), адзін з кіраўнікоў камуніст. падполля на тэр. Беларусі, акупіраванай герм. войскамі. Чл. ЦК КП(б)Б у 1918, ЦВК БССР у 1919. З 1919 у Наркамаце шляхоў зносін. У 1935—41 заг. кафедры, дэкан Маскоўскага ін-та гісторыі, філасофіі і л-ры. Загінуў у Вял. Айч. вайну ў баі пад Вязьмай.

**АЛІ́-БЕЙ АЛЬ-КАБІ́Р**, Алі-бей (1728, Абхазія — 8.5.1773), правіцель Егіпта з 1757. Дзіцем прададзены ў рабства. У Егіпце з 1747, воін-раб (мамлюк) правіцеля краіны Ібраіма Кетходы, у 1748 атрымаў свабоду, стаў беем. У час *руска-турэцкай вайны 1768—74* узняў паўстанне супраць Турцыі. У 1770 абвясціў незалежнасць Егіпта і стаў яго султанам. У 1771 завяваў амаль усю Сірыю. У 1773 разбіты мяцежнікамі, паранены і ўзяты ў палон. Памёр ад ран.

**А́ЛІБІ** (ад лац. alibi у іншым месцы), у крымінальным працэсе акалічнасць, якая сведчыць пра адсутнасць асобы на месцы злачынства ў момант яго ўчынення; бясспрэчны доказ невінаватасці *абвінавачанага* па справе, дзе ён прыцягваецца да адказнасці за фізічны ўдзел у злачынстве. А. не выключае абвінавачання ў саўдзельніцтве (напр., падбухторванне, дапамога і інш.).

**АЛІБІДЭМІ́Я** (ад *а*... + *лібіда*), поўная адсутнасць *лібіда*. Уласціва пераважна жанчынам. Найчасцей вынік прыроджаных або набытых нейраэндакрынных расстройстваў, якія прыводзяць да недаразвіцця ўсёй палавой сферы (інфантылізму) або да другаснага зніжэння (амаль да поўнага знікнення) палавой цягі. Прычынай А. з'яўляюцца таксама інтаксікацыі наркотыкамі, нейралептыкамі, транквілізатарамі, постінфекц. пашкоджанні гіпаталамуса, узроставая інвалюцыя (гл. *Клімакс*). У выключных выпадках А. можа быць вынікам няправільнага выхавання. У мужчын надзвычай рэдкая і абумоўлена ў асноўным глыбокай паталогіяй гіпаталама-гіпафізарна-ганаднай сістэмы, часцей недаразвіццём усёй палавой сістэмы.

**АЛІВІ́Н** (ад лац. oliva аліва), група мінералаў падкласа астраўных сілікатаў. Гал. прадстаўнікі — фарстэрыт $Mg_2SiO_4$, фаяліт $Fe_2SiO_4$, тэфраіт $Mn_2SiO_4$ утвараюць ізаморфныя рады. Крышталі каротказлупкаватыя, рамбічнай сінганіі. Агрэгаты зярністыя. Колер ад жаўтавата-зялёнага да зеленавата-чорнага. Бляск шкляны. Цв. 6—7. Крохкі. Шчыльн. 3,2—4,4 г/см$^3$. Пародаўтваральны мінерал магматычнага паходжання. Пашыраны ў асн. і ультраасн. вывергнутых пародах. Фарстэрыт — сыравіна для вогнетрывалых матэрыялаў. Празрысты залаціста-зялёны А. — каштоўны камень *хрызаліт* (перыдот).

Алівін.

**АЛІГА**... (ад грэч. oligos нешматлікі, нязначны), першая састаўная частка складаных слоў, якая паказвае на малую колькасць, нешматлікасць чаго-н., на адхіленне ад нормы ў бок памяншэння, напр. *алігамеры, алігаполія*.

**АЛІГАКЛА́З** (ад *аліга*... + грэч. klasis трэшчына), мінерал групы палявых шпатаў падкласа каркасных сілікатаў (*плагіяклазаў*). Ізаморфная сумесь з 10—30% *анартыту* $Ca[Al_2Si_2O_8]$ і 70—90% *альбіту* $Na[AlSi_3O_8]$. Колер шэры ці з рознымі адценнямі. Бляск ад шкляного да перламутравага. Празрысты да паўпразрыстага. Цв. 6. Шчыльн. 2,65 г/см$^3$. Пародаўтваральны мінерал гранітаў, гнейсаў, гранітных пегматытаў. Некаторыя А. выкарыстоўваюць як вырабныя камяні (месяцавы камень) і як ювелірны матэрыял (сонечны камень).

Алігаклаз.

**АЛІГАМЕ́РЫ**, члены гамалагічных шэрагаў, якія па памеры малекул (мал. м.) займаюць прамежкавае становішча паміж *манамерамі* і *высокамалекулярнымі злучэннямі*. Верхняй мяжой мал. масы А. з'яўляецца яе значэнне, пры якім праяўляюцца ўласцівасці высокамал. злучэнняў, у палярных А. — $1{,}5 \cdot 10^4$, у непалярных — $5 \cdot 10^3$. Метады сінтэзу А. заснаваныя на рэакцыях абмежавання росту макрамалекул (гл. *Тэламерызацыя* і *Полікандэнсацыя*) і на дэструкцыі высокамал. злучэнняў. Да сінтэтычных А. належаць поліэфірныя, алкідныя, фенола-фармальдэгідныя, эпаксідныя смолы, вадкія каўчукі, сінт. маторнае паліва і інш. Прыродныя А. — алігацукрыды, алігануклеатыды, цыклаалігапептыды, оксітацын і інш.

**АЛІГАПО́ЛІЯ** (ад *аліга*... + грэч. pōlēo прадаю), тып рыначнай структуры, у якой значная ці пераважная частка галіновай вытв-сці і збыту ажыццяўляецца на аснове спалучэння *манаполіі* і *канкурэнцыі*. Характэрна для большасці галін сучаснай рыначнай эканомікі.

Сутнасць А. ў тым, што абмежаваная колькасць буйных кампаній манапалізуе вытв-сць і збыт асн. ці нават большай часткі прадукцыі пэўнай галіны эканомікі ўзгадненнем узроўню цэн, якое ажыццяўляецца двума шляхамі: лідэрствам у цэнах (цэны, устаноўленыя адной з фірмаў, як правіла, найб. буйной, выкарыстоўваюцца і інш. фірмамі) і выбарам узгодненых правілаў паводзін (усе буйныя кампаніі прымаюць адзіныя правілы вылічэння цэн). Адначасова ўсе гэтыя кампаніі вядуць паміж сабой жорсткую нецанавую канкурэнцыю, каб пры ўзгодненых цэнах стварыць для сябе найб. спрыяльныя ўмовы за кошт рэкламы, тэхн. перааснашчэння вытворчасці і паляпшэння якасці прадукцыі, удасканалення формаў і метадаў збыту, прадастаўлення пакупнікам пэўных паслуг, гарантый, ільгот. Каб нейтралізаваць разбуральнае ўздзеянне на эканоміку манаполіі і канкурэнцыі, дзяржава імкнецца забяспечыць аптымальнае спалучэнне гэтых сіл на аснове антыманапольнай палітыкі. *І.А.Мацулевіч.*

**АЛІГАПСО́НІЯ** (ад *аліга*... + грэч. opsōnia закупка прадуктаў харчавання), тып рыначнай структуры, у якой у адрозненне ад *алігаполіі* замест абмежаванай колькасці вытворцаў-прадаўцоў дзейнічае абмежаваная колькасць буйных кампаній-пакупнікоў.

**АЛІГА́РХІЯ** (ад грэч. oligarchia улада нямногіх), форма праўлення, пры якой улада належыць невял. групе людзей, звычайна найб. радавітых або заможных. Была характэрная для стараж. Афін, у сярэднявеччы для рэспублік Венецыянскай, Генуэзскай, у 17—18 ст. для Рэчы Паспалітай і інш. А. называ-

юць таксама саму́ю кіруючую групу, напр. *Фінансавая алігархія.*

**АЛІГАСАПРО́БЫ** (ад *аліга...* + грэч. sapros гнілы + bios жыццё), арганізмы, якія жывуць у чыстых або слаба забруджаных арган. рэчывамі водах з лішкам растворанага кісларо́ду. Для А. характэрна вял. відавая разнастайнасць пры павольнай змене згуртаванняў. Да іх належаць: зялёныя і дыятомавыя водарасці і кветкавыя расліны (напр., гарлачык белы); некаторыя калаўроткі, лічынкі стракоз і аўсянікаў, дафніі; сцерлядзь, фарэль; трытоны. Сярод А. шмат драпежнікаў, але мала *сапратрофаў*, у т.л. бактэрый і арганізмаў, якія кормяцца бактэрыямі. Выкарыстоўваюцца як біял. індыкатары ступені забруджанасці вадаёмаў шкоднымі рэчывамі.

**АЛІГАСПЕРМІ́Я** (ад *аліга...* + грэч. sperma семя), гіпаспермія, гіпавалюмія, памяншэнне аб'ёму спермы, што выліваецца пры семявыяржэнні. Аб'ём спермы пры А. не перавышае 1—1,5 мл (норма 2—5 мл). Прычыны А.: гарманальная недастатковасць, прыроджаныя, генетычныя захворванні, аспермія, азааспермія, хранічныя прастатыты рознага генезісу, псіхічная стомленасць, нерв. перанапружанне, алкагалізм, дрэннае харчаванне. Магчыма і ў здаровых мужчын пры занадта частых палавых або ананістычных актах.

**АЛІГА́Т** (ад лац. alligo прывязваю), пераплеценыя ў адзін том самастойныя выданні або рукапісы. Ствараецца звычайна з-за нязручнасці захоўвання тонкіх, непераплеценых кніг, брашур, сшыткаў паводле алфавітнага або тэматычнага (гл. *Канвалют*) прынцыпу.

**АЛІГА́ТАРЫ** (Alligatoridae), сямейства паўзуноў атр. кракадзілаў. Уключае ўласна А. (Alligator) і кайманаў. Жывуць пераважна ў Паўн. і Паўд. Амерыцы ў прэсных вадаёмах; выключэнне — кітайскі А. (A. sinensis), жыве ў р. Янцзы.

Уласна А. 2 віды: місісіпскі А. (A. mississippiensis) даўж. да 5,8 м, водзіцца ў балотах Фларыды (ЗША) і кітайскі А. да 2,5 м. Маюць добра развіты мозг, 4-камернае сэрца, перапонку паміж пальцамі пярэдніх ног. Морда шырокая і кароткая. Драпежнікі. Маладыя кормяцца насякомымі і ракападобнымі, дарослыя — рыбай, жабамі, птушкамі, млекакормячымі. У выніку інтэнсіўнага промыслу на скуру і мяса А. іх колькасць вельмі скарацілася. У шэрагу краін створаны буйныя гадавальнікі для штучнага развядзення А.

**АЛІГАТО́НІКА** (ад *аліга...* + грэч. tonos тон), сістэма з малой колькасцю гукаў, дзе ўсе тоны функцыянальна раўнапраўныя. Для А. характэрныя сціслыя мелодыі-мадэлі (тэрцавыя, кварта вы я), экспрэсіўная сіла якіх заснавана на прынцыпе раўназначнасці ўсіх выразных сродкаў (ладавых, рытмічных, інтанацыйных, тэмбравых). У муз. фальклоры беларусаў тыповая для стараж. песеннага пласта, асабліва для песень каляндарна-земляробчага цыкла.

*Літ.:* Квитка К.В. Ладовые системы в музыке славян и соседних народов // Избр. тр. М., 1971. Т. 1; Елатов В.И. Ладовые основы белорусской народной музыки. Мн., 1964; Можейко З.Я. Календарно-песенная культура Белоруссии. Мн., 1985.

*З.Я.Можэйка.*

**АЛІГАТРО́ФНАЕ БАЛО́ТА**, гл. *Вярховае балота.*

**АЛІГАТРО́ФЫ** [ад *аліга...* + *...троф*(ы)], расліны і мікраарганізмы, здольныя развівацца ў асяроддзі з нізкай канцэнтрацыяй пажыўных рэчываў. Да аліга трофных раслін Беларусі, якія растуць на глебах, бедных элементамі мінер. харчавання, належаць сфагнавыя імхі, верас звычайны, сівец стаячы, цмен пясчаны, агаткі двухдомныя, падвей похвенны, багун балотны, журавіны і інш. расліны вярховых балотаў, сухадолаў і пяскоў. Алігатрофныя мікраарганізмы жывяцца простымі арган. злучэннямі — арган. к-тамі, спіртамі. Многія з іх маюць прыстасаванні для павелічэння паверхні клеткі (спіральная будова клетак у спірылы, прастэкі ў прастэкабактэрый).

Алігатары: 1 — місісіпскі; 2 — кайманавы; 3 — кітайскі.

**АЛІГАФА́ГІ** [ад *аліга...* + *...фаг*(і)], жывёлы, якія спажываюць вельмі абмежаваны набор кармоў. Да іх належаць многія членістаногія, чэрві, малюскі, рыбы, птушкі, млекакормячыя. Найб. пашыраны ў трапічных лясах. У фауне Беларусі А. ёсць сярод насякомых (клубеньчыкавыя даўганосікі, каларадскі жук), павукоў, кляшчоў, чарвей, рыб, птушак (насякомаедныя — асаед звычайны, драпежнікі-рыбаеды — скапа, драпежнікі-арнітафагі — ястраб-перапёлачнік, ястраб-цецяроўнік), млекакормячых (траваедныя, пладаедныя і інш.). Гл. таксама *Манафагі, Паліфагі.*

**АЛІГАФРЭНАПЕДАГО́ГІКА** (ад *аліга...* + грэч. phrēn розум + *педагогіка*), раздзел *дэфекталогіі*, які вывучае праблемы выхавання, навучання і шляхі карэкцыі недахопаў развіцця разумова адсталых дзяцей (гл. *Алігафрэнія*), а таксама пытанні іх сац. рэабілітацыі. Цесна звязана з псіхіятрыяй, педагогікай, мед. навукамі (педыятрыяй, неўралогіяй, псіхапаталогіяй і інш.). На Беларусі пытанні А. распрацоўваюць дэфектолагі Бел. пед. ун-та, Нац. ін-та адукацыі і інш. Распрацавана канцэпцыя навучання, выхавання і падрыхтоўкі да жыцця дзяцей з адхіленнямі ў разумовым і фіз. развіцці (Т.Л.Ляшчынская, У.А.Шынкарэнка і інш.). Працуюць спец. школы ў Гродне, Мінску, Полацку.

**АЛІГАФРЭНАПСІХАЛО́ГІЯ** (ад *аліга...* + грэч. phrēn розум + *псіхалогія*), раздзел спец. *псіхалогіі*, які вывучае псіхічнае развіццё і магчымасць яго карэкцыі ў дзяцей з інтэлектульнымі недахопамі, распрацоўвае метады і прыёмы выхавання і навучання такіх дзяцей. Даныя А. выкарыстоўваюць у *алігафрэнапедагогіцы.* На Беларусі пытанні А. распрацоўваюць у Бел. пед. ун-це, Ін-це павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў адукацыі. Даследаваны асаблівасці мыслення (Т.А.Працко), моўнай дзейнасці (К.Г.Ярмілава, Л.І.Алексіна) разумова адсталых дзяцей, выяўленчай дзейнасці вучняў дапаможных школ (З.А.Апацкая), псіхал. структура затрымкі псіхічнага развіцця ў дзяцей дашкольнага ўзросту (А.С.Сляповіч).

**АЛІГАФРЭ́НІЯ** (ад *аліга...* + грэч. phren розум), разумовая недаразвітасць, прыроджаная ці набытая ў першыя гады жыцця дзіцяці. Прычыны: паталогія на ўзроўні генаў і храмасом, неспрыяльнае ўздзеянне экзагенна-арган. фактараў на мозг зародка, плода дзіцяці (алкагалізм бацькоў, таксікозы, асфіксія пры родах, нейраінфекцыі, чэрапна-мазгавыя траўмы і інш.). Найб. тыповыя прыкметы А. — недаразвіццё абстрактна-лагічнага мыслення, зніжэнне памяці, малы запас слоў. Інтэлектуальная недастатковасць часта спалучаецца з заганамі развіцця органаў, сістэм, будовы цела. Адрозніваюць лёгкую, сярэднюю, цяжкую і глыбокую А.

Дзеці з лёгкай ступенню разумовай адсталасці (дэбільныя) у стане авалодаць праграмай дапаможнай школы, моўнымі навыкамі і нескладанымі прафесіямі; каэф. інтэлектуальнага развіцця 50—69 балаў. Да сярэдняй ступені разумовай адсталасці (імбецільнасць) адносяцца дзеці з каэф. інтэлектуальнага развіцця 35—49 балаў, здольныя авалодаць толькі элементамі мовы і навыкамі самаабслугоўвання. Сістэматычная вучэбная і прац. дзейнасць недаступная. Дарослыя самастойна жыць не могуць. Пры цяжкай ступені разумовай адсталасці (каэф. інтэлектуальнага развіцця 20—34 балы) інтэлектуальная недастатковасць больш выяўлена, парушана маторыка, ёсць фіз. дэфекты. Хворыя з глыбокай разумовай адсталасцю (ідыятыя) не маюць вышэйшых псіх. функцый, мова не развіваецца, увага не засяроджваецца, рэакцыя рэзка зніжана; каэф. інтэлектуальнага развіцця

ніжэй за 20 балаў. Патрабуюць пастаяннага догляду. Лячэнне А. сімптаматычнае.

*Ф.М.Гайдук.*

**АЛІГАХЕ́ТЫ**, гл. *Малашчацінкавыя чэрві.*

**АЛІГАЦУКРЫ́ДЫ**, вугляводы, у малекулах якіх ад 2 да 10 монацукрыдных астаткаў, злучаных паміж сабой т.зв. гліказіднай сувяззю. Займаюць прамежкавае становішча паміж *монацукрыдамі* і *поліцукрыдамі*. Паводле ступені палімерызацыі падзяляюцца на ды-, тры-, тэтрацукрыды і г.д. У свабодным стане пашыраны ў жывых арганізмах, фрагменты ўваходзяць у склад прыродных *гліколіпідаў, флаваноідаў, алкалоідаў, сапанінаў*, некаторых *антыбіётыкаў* і інш. Найважнейшыя А. — *цукроза* (трысняговы цукар), *мальтоза* (соладавы цукар), *лактоза* (малочны цукар). З інш. прыродных А. найб. вядомы рафіноза (у цукр. бураках і інш. вышэйшых раслінах), мелецытоза (у соку хвойных дрэў), трэгалоза (гал. цукар гемалімфы многіх насякомых), цэлабіёза (асн. структурная адзінка *цэлюлозы*).

Г.А.ліеў.

Атрымліваюць А. ферментатыўным або частковым кіслотным гідролізам поліцукрыдаў; шэраг аналагаў сінтэзаваны штучна. Маюць важнае значэнне ў харчаванні чалавека (асабліва цукроза і лактоза). Зрэдку бывае непераноснасць арганізмам асобных відаў А., што абумоўлена прыроджанай адсутнасцю ў кішачным соку ферментаў, якія расшчапляюць А. на монацукрыды (суправаджаецца захворваннямі, часам гібеллю арганізма).

**АЛІГАЦЭ́НАВЫ АДДЗЕ́Л (ЭПО́ХА)**, алігацэн (ад *аліга...* + грэч. kainos новы), трэці, верхні аддзел *палеагенавай сістэмы* (перыяду) у геахраналагічнай шкале (гл. *Геахраналогія*); заключная эпоха палеагенавага перыяду геал. гісторыі Зямлі. Падзяляецца на ніжні і верхні пададдзелы. На Беларусі з адкладамі алігацэну звязаны радовішчы бурага вугалю, тугаплаўкіх і вогнетрывалых глінаў, фармовачных і шкловых пяскоў, бурштыну.

**АЛІГАЦЭНО́З** (ад *аліга...* + грэч. koinos агульны), *фітацэноз*, у склад якога ўваходзіць толькі некалькі відаў вышэйшых раслін — *прадуцэнтаў*.

**АЛІГАЭФІРАКРЫЛА́ТЫ**, поліэфіракрылаты, сінтэтычныя алігамеры, прадукты ўзаемадзеяння мнагаатамных спіртоў з многаасноўнымі к-тамі ў прысутнасці рэгулятараў росту макрамалекул (напр., акрылавыя к-ты). Бясколерныя вязкія вадкасці ці цвёрдыя рэчывы. Маюць высокую рэакцыйную здольнасць. Выкарыстоўваюцца ў выт-сці шклапластыкаў, лакафарбавых матэрыялаў, клеяў, кампаўндаў, палімербетону, герметыкаў, друкарскіх формаў.

**АЛІЕ́Р** Маргарыта Іосіфаўна (7.10.1915, г. Адэса — 1.8.1992), рус. паэтэса. Вучылася ў Літ. ін-це імя Горкага (1934—37). Першы зб. «Год нараджэння» (1938). Вершы і паэмы часоў Вял. Айч. вайны склалі кнігі «Памяці храбрых» (1942), «Лірыка» (1943), «Вершы і паэмы» (1944); за паэму «Зоя» Дзярж. прэмія СССР 1943. Аўтар зб-каў «Ленінскія горы» (1953), «Сіні час» (1970), «Чвэрць стагоддзя» (1981), кніг нарысаў «Вяртанне ў Чылі» (1966); успамінаў «Сцяжынка ў жыце. Пра паэзію і паэтаў» (1980). Асаблівасці паэзіі А.: строгасць верша і думкі, увага да духоўнага свету чалавека, жывыя размоўныя інтанацыі. Выдала кн. перакладаў «Вялізны свет» (1968).

*Тв.:* Собр. соч. Т. 1—3. М., 1984—85.

**АЛІЕ́ВА** Фазу Гамзатаўна (н. 5.12.1932, с. Гінічутль Хунзахскага р-на, Дагестан), аварская паэтэса. Нар. паэтэса Дагестана (1969). Скончыла Літ. ін-т імя Горкага ў Маскве (1961). Піша на аварскай і рус. мовах. Лірыка А. тэматычна і вобразна звязана з рэчаіснасцю, метафарычна перадае шматграннасць жыцця (зб-кі «Роднае сяло», 1959; «Вясёлку раздаю», 1963; «Васемнаццатая вясна», 1968; «Вочы дабра», 1983). Раманы «Камяк зямлі вецер не знясе» (1967), «Радавы герб» (1970), «Арол вострыць дзюбу аб камень» (1974), «Восьмы панядзелак» (1978) і інш. пра сучаснае жыццё Дагестана.

*Тв.:* Рус. пер. — Собр. соч. Т. 1—3. М., 1990.

**АЛІЕ́Ў** Гейдар Алі Рза аглы (н. 10.5.1923, г. Нахічэвань), дзярж. і паліт. дзеяч Азербайджана. Двойчы Герой Сац. Працы (1979, 1983). Скончыў Азерб. ун-т. З 1941 у органах дзярж. бяспекі, СМ Нахічэванскай АССР. У 1950—64 у МДБ, МУС і КДБ Азерб. ССР; з 1967 старшыня КДБ пры СМ Азерб. ССР. З 1969 1-ы сакратар ЦК КП Азербайджана. У 1982—87 1-ы нам. старшыні СМ СССР. Чл. Палітбюро ЦК КПСС у 1982—87. Дэп. Вярх. Савета СССР у 1970—87. З 3.10.1993 прэзідэнт Азербайджана.

**АЛІЗАРО́ЎСКІ** Аарон (Адам, Аляксандр, 1618, Віцебшчына — 1659), правазнавец, палітолаг, сацыёлаг. Вучыўся ў навуч. установах Беларусі, Польшчы, Аўстрыі, Германіі, Італіі. Д-р права (1645), праф. Віленскай акадэміі. Адзін з найбуйнейшых прадстаўнікоў свецкага кірунку ў сацыялагічнай і палітыка-прававой думцы Беларусі 17 ст. У працы «Аб палітычнай супольнасці людзей» (Гданьск, 1651) насуперак сярэдневяковым традыцыям, тэалагічным тэорыям пра дзяржаву і права разглядаў з'явы грамадскага жыцця з пункту гледжання прыроды чалавека і патрабаванняў чалавечага розуму, крытыкаваў падняволную працу і прыгнёт сялян, заклікаў да грамадскакарыснай працы.

**АЛІЗАРЫ́Н**, 1,2-дыгідраксіантрахінон, араматычнае злучэнне, $C_{14}H_8O_4$. Мал. м. 240, 20; фарбавальнік. Аранжава-чырвоныя крышталі, $t_{пл}$ 289 °С, малараствaральныя ў вадзе. Здабываўся з кораня марэны, у 1869 атрыманы штучна з *антрацэну*. Нерастваральныя ў вадзе солі А. з многавалентнымі металамі выкарыстоўваліся для фарбавання і друкавання на тканінах з натуральных валокнаў (соль алюмінію — для атрымання чырвонага колеру, хрому — карычневага, жалеза — фіялетавага). Выкарыстоўваецца для маст. і паліграфічных фарбаў; аналітычны рэагент у хім. аналізе.

**АЛІКА́НТЭ** (Alicante), горад на ПдУ Іспаніі, у аўт. вобласці Валенсія. Адм. цэнтр правінцыі Алікантэ. 268 тыс. ж. (1990). Порт на Міжземным м. Лёгкая і харч. прам-сць. Цэнтр раёна субтрапічнага пладаводства (вінаградарства і інш.). Кліматычны курорт. Сярэдневяковы замак Санта-Барбара, ратуша і інш. арх. помнікі 17—18 ст.

**АЛІЛУ́ЕВЫ**, сям'я рас. рэвалюцыянераў і сав. паліт. дзеячаў. Сяргей Якаўлевіч (25.9.1866, с. Рамані Новахапёрскага р-на Варонежскай вобл. — 27.7.1945), адзін з першых рас. сацыял-дэмакратаў (з 1896) і актывістаў камуніст. партыі. Удзельнік трох рас. рэвалюцый. У гады грамадз. вайны на падп. рабоце на Украіне і ў Крыме. З 1921 на кіруючых гасп. пасадах. Надзея Сяргееўна (вер. 1901, Баку — 9.11.1932), удзельніца Кастр. рэвалюцыі і грамадз. вайны. Дачка Сяргея Якаўлевіча. Жонка І.В.*Сталіна*. Не падзяляла многіх поглядаў мужа. Наконт яе смерці (самагубства) існуюць розныя версіі. Дачка Сталіна і Надзеі Сяргееўны Святлана Іосіфаўна (н. 28.2.1926, Масква) з 1967 у эміграцыі, жыве ў Англіі. Аўтар успамінаў «Дваццаць пісьмаў да сябра» (1990), «Далёкая музыка» (1992).

**АЛІЛУ́Я** (ад стараж.-яўр. халелуя хваліце Бога), у хрысціянскім богаслужэнні прыпеў царк. песнапення, ва іудаізме заклік да ўхвалення Бога. Часта трапляецца ў псалмах Давіда, Старым і Новым Запаветах.

**АЛІМДЖА́Н ХАМІ́Д** (сапр. Азімаў Хамід Алімджанавіч; 12.12.1909, г. Джызак, Узбекістан — 3.7.1944), узбекскі пісьменнік. Чл.-кар. АН Узбекістана (1943). У 1928—31 вучыўся ў Узб. пед. акадэміі ў Самаркандзе. Пад уплывам У.Маякоўскага распрацоўваў ва узб. паэзіі новыя паэт. формы (зб-кі вершаў «Вясна», 1929; «Ранішні ветрык», 1930; «Ноч на рацэ», 1936; «Край», 1939; паэмы «Айгуль і Бахціяр», «Зайнаб і Аман», абедзве 1938; «Шчасце», 1940).

Патрыятычнасцю, актуальнасцю адметныя творы перыяду Вял. Айч. вайны (зб. «Вазьмі зброю ў рукі!» і «Маці і сын», 1942; «Вера», 1943; гіст. драма «Мукана», 1943; паэма «Слёзы Раксканы», 1944). Аўтар прац па праблемах узб. класічнай і сучаснай л-ры, яе ўзаемасувязях з фальклорам і інш. л-рамі.

*Тв.:* Бел. пер. — у зб.: Спявае Узбекістан. Мн., 1962; Сонца ў арыках. Мн., 1966; Рус. пер. — Избранное. М., 1979.

**АЛІМЕНТА́ЦЫЯ** (ад лац. alimentum харчаванне, утрыманне), у Стараж. Рыме сістэма дзярж. дапамогі дзецям беднякоў і сіротам. Уведзена імператарам Нервам у канцы 1 ст., існавала да сярэдзіны 3 ст. н.э. Аліментацыйны фонд складваўся з працэнтаў, атрыманых ад землеўладальнікаў за выдачу ім дзярж. пазык.

**АЛІМЕ́НТЫ**, сродкі, якія ва ўстаноўленых законам выпадках адны члены сям'і абавязаны выплачваць другім. Склад суб'ектаў і асновы ўзнікнення аліментных абавязацельстваў, памер і тэрміны выплаты вызначаюцца заканадаўствам. На Беларусі асн. крыніца прававых нормаў рэгулявання гэтых пытанняў — Кодэкс аб шлюбе і сям'і. Паводле суб'ектнага складу адрозніваюць аліментныя абавязацельствы паміж мужам і жонкай; бацькамі і дзецьмі; айчымам, мачахай і пасынкамі (падчарыцамі); братамі і сёстрамі; дзедам, бабкай і ўнукамі. Пры адмаўленні ад добраахвотнай выплаты А. могуць быць спагнаны праз суд. За наўмыснае ўхіленне ад выплаты прысуджаных А. на карысць непрацаздольных дзяцей або бацькоў прадугледжана крымін. адказнасць.

**АЛІМЖА́НАЎ** Ануар (Ануарбек) Турлубекавіч (2.5.1930, аул Карлыгаш, Андрэеўскі р-н Талды-Курганскай вобл., Казахстан —1993), казахскі пісьменнік. Скончыў Казахскі ун-т (1954). У яго аповесцях «Караван ідзе да сонца» (1963), «Сінія горы» (1964; Дзярж. прэмія Казахстана 1967), «Сувенір з Атрара» (1966; Міжнар. прэмія імя Дж. Нэру 1969), «Трон Рудакі» (1974) і інш. — мінулае і сучаснае Казахстана. Аўтар гіст. трылогіі «Стэпавае рэха» (1969—79).

*Тв.:* Избранное. Т. 1—2. Алма-Ата, 1979.

*Ж.Сахіеў.*

**АЛІ́МП** (Olympos), самы высокі горны масіў у Грэцыі. Выш. 2917 м. Складзены з вапнякоў і сланцаў. Вечназялёныя хмызнякі, шыракалістыя і хваёвыя лясы. Нац. парк (пл. каля 4 тыс. га, засн. ў 1938). У стараж.-грэч. міфалогіі А. — месца, дзе жывуць багі. Лічылася, што на А. знаходзяцца палацы Зеўса і інш. багоў, пабудаваныя і ўпрыгожаныя Гефестам. А. таксама сімвал вярхоўнай улады новага пакалення багоў — *алімпійцаў*, якія перамаглі *тытанаў*.

**АЛІ́МПІЙ** (Аліпій; ? — 17.8.1114), старажытнарускі жывапісец і ювелір. Манах Кіева-Пячэрскай лаўры, з 1084 удзельнічаў у размалёўцы яе Успенскага сабора. Есць меркаванне, што А. пісаў абразы, выканаў мазаікі для сабора Кіева-Міхайлаўскага Залатаверхага манастыра.

**АЛІМПІ́ЙСКАЯ ВЁСКА**, комплекс будынкаў гасцінічнага тыпу, у якіх на час *Алімпійскіх гульняў* размяшчаюцца дэлегацыі краін-удзельніц. Мае шэраг дапаможных памяшканняў (сталовыя, магазіны, аддз. сувязі, трэніровачныя залы і пляцоўкі, культ. цэнтр і інш.). Упершыню пабудавана да IX Алімп. гульняў у Парыжы (1924), складалася з драўляных будынкаў, таму і наз. «вёска». Будаўніцтва А.в. — абавязак *алімпійскага горада*.

**АЛІМПІ́ЙСКАЯ СІМВО́ЛІКА**, сістэма атрыбутаў, агульных для ўсяго алімпійскага руху. Уключае алімпійскі сімвал, дэвіз (разам складаюць алімпійскую эмблему) і сцяг. Алімпійскі сімвал — 5 пераплеценых кольцаў блакітнага, чорнага, чырвонага, жоўтага і зялёнага колераў — аб'яднанне ў алімпійскім руху пяці кантынентаў. Алімпійскі дэвіз — «Citius, altius, fortius» («Хутчэй, вышэй, мацней»). Існуюць таксама неафіц. дэвізы (сфармуляваны П. дэ *Кубертэнам*): «Спорт — гэта мір», «Галоўнае не перамагчы, галоўнае — удзельнічаць». Алімпійскі сімвал і дэвіз зацверджаны *Міжнародным алімпійскім камітэтам* (МАК) у 1913. Ен жа зацвердзіў іх у 1920 як часткі афіц. алімпійскай эмблемы, права выкарыстоўваць яе маюць толькі МАК і нац. алімпійскія к-ты. Алімпійскі сцяг — белае палотнішча з алімпійскім сімвалам у цэнтры; зацверджаны МАК у 1913. Вывешваецца на алімпійскіх спаборніцтвах з 1920. Спалучэнне колераў сцяга і алімпійскіх кольцаў сімвалізуе колеры ўсіх нацый. Да А.с. адносяцца таксама афіц. эмблемы нац. алімпійскіх к-таў (спалучаюць алімпійскі сімвал з элементамі дзярж. геральдыкі), Алімпійскіх гульняў, сесій, кангрэсаў, т.зв. спадарожныя алімпійскія сімвалы (талісманы гульняў, піктаграмы, тэрміны-надпісы і інш.). Выкарыстанне А.с. ў рэкламных і камерцыйных мэтах, не звязаных з алімпійскім рухам, забаронена *алімпійскай хартыяй*.

Да арт. Алімпійская сімволіка. Алімпійскі сцяг.

**АЛІМПІ́ЙСКАЯ ХА́РТЫЯ**, збор статутных дакументаў па пытаннях алімпійскага руху. Зацверджана ў 1894 Міжнар. спарт. кангрэсам у Парыжы. Вызначае асн. мэты, прынцыпы, палажэнні і правілы арганізацыі і правядзення *Алімпійскіх гульняў*. Гал. палажэнні А.х. распрацаваны П. дэ *Кубертэнам*. Складаецца з 5 раздзелаў, афіц. тлумачэнняў і інструкцый, якія маюць абавязковы характар. Да А.х. прыкладаюцца правілы правядзення рэгіянальных гульняў, якія апякуе *Міжнародны алімпійскі камітэт*.

**АЛІМПІ́ЙСКІ ГО́РАД**, горад, у якім праводзяцца *Алімпійскія гульні*. Паводле *Алімпійскай хартыі* такое права надаецца гораду, а не краіне. Выбіраецца сесіяй Міжнар. алімпійскага к-та не пазней як за 6 гадоў да пачатку гульняў. Заяўка на правядзенне алімпіяды павінна быць ухвалена Нац. алімпійскім к-там і падтрымана ўрадам краіны, які таксама дае пісьмовыя гарантыі аб выкананні спец. умоў для гарадоў-кандыдатаў.

**АЛІМПІ́ЙСКІ РУХ**, міжнародны грамадскі рух, накіраваны на прапаганду і

Алімпійская вёска ў Мюнхене. 1972.

развіццё спорту праз падрыхтоўку і арганізацыю *Алімпійскіх гульняў*. Аб'ядноўвае мільёны людзей незалежна ад паліт. і рэліг. перакананняў, расавай прыналежнасці на прынцыпах раўнапраўя, дэмакратыі і ўзаемнай павагі. Асн. мэты і прынцыпы А.р. выкладзены ў *Алімпійскай хартыі*. Арганізац. аснова А.р. — *Міжнародны алімпійскі камітэт* (МАК), *Нацыянальныя алімпійскія камітэты* (НАК) і іх кантынентальныя аб'яднанні (Асацыяцыя нац. алімпійскіх к-таў, Алімпійскі Савет Азіі, Асацыяцыя еўрап. нац. алімпійскіх к-таў і інш.), арганізац. к-ты Алімпійскіх гульняў, міжнар. і нац. федэрацыі па *алімпійскіх відах спорту*. Важную ролю ў развіцці А.р. адыгрываюць алімпійскія кангрэсы, сесіі МАК, дзейнасць яго спецыялізаваных камісій і інстытутаў, а таксама розных міжнар. спарт. арг-цый (Трыбунал спарт. арбітража, Вярх. Савет міжнар. спарт. арбітража, Міжнар. алімпійская асацыяцыя даследаванняў у спарт. медыцыне і інш.). А.р. мае свае традыцыі, рытуалы, *алімпійскую сімволіку*.

Гісторыя сучаснага А.р. пачынаецца з канца 19 ст. Па ініцыятыве франц. педагога, гісторыка і грамадскага дзеяча П. дэ *Кубертэна* ў 1894 у Парыжы адбыўся І Міжнар. спарт. (алімпійскі) кангрэс, які прыняў рашэнне аднавіць на сучаснай аснове Алімпійскія гульні. Праграмныя і арганізац. асновы А.р., распрацаваныя Кубертэнам і яго паплечнікамі, удасканальваліся на працягу наступных дзесяцігоддзяў.

Розныя праграмы МАК па каардынацыі дзейнасці нац. алімпійскіх к-таў прадугледжваюць дапамогу ім у развіцці А.р. ў сваіх краінах (асн. з іх — праграма «Алімпійская салідарнасць»). Дзейнічаюць Міжнар. алімпійская акадэмія (засн. ў 1961 у Алімпіі, рыхтуе спецыялістаў вышэйшага класа ў розных галінах спорту), Алімпійскі музей (засн. ў 1993 у Лазане, Швейцарыя), Міжнар. алімпійская федэрацыя філатэлістаў (з 1982). Існуе сістэма алімпійскіх узнагарод — медалі для пераможцаў і прызёраў гульняў, Алімпійскі кубак і Алімпійскі ордэн (прысуджаюцца за асаблівыя заслугі ў развіцці А.р.) і інш. У сістэме А.р. вылучаюцца рэгіянальныя спарт. спаборніцтвы пад патранажам МАК (Азіяцкія, Афрыканскія, Панамерыканскія і інш. гульні), спаборніцтвы, што наладжваюцца пасля Алімпійскіх гульняў у *алімпійскім горадзе* для спартсменаў-інвалідаў (гл. *Параалімпійскія гульні*). На Беларусі А.р. кіруе *Нацыянальны алімпійскі камітэт Беларусі*.

*Літ.:* Le mouvement olympique = The olympic movement. Lausanne, 1993.

*Г.К.Кісялёў.*

**АЛІМПІ́ЙСКІЯ ВІ́ДЫ СПО́РТУ**, спартыўныя дысцыпліны, прызнаныя міжнар. алімпійскім к-там (МАК) і ўключаныя ў праграму *Алімпійскіх гульняў*. Гал. ўмовы прызнання А.в.с. — вял. іх пашырэнне ў свеце, наяўнасць міжнар. спарт. федэрацый і іх прызнанне МАК, правядзенне сусв., рэгіянальн-

Да арт. **Алімпійскія гульні**: эмблема Алімпійскіх гульняў у Атланце (1996); запальванне алімпійскага агню ў Лілехамеры (1994; уверсе); вокладка часопіса «World of Gymnastics» з выявамі чэмпіёнаў Алімпійскіх гульняў у Барселоне; дэлегацыя Беларусі на зімовых Алімпійскіх гульнях у Лілехамеры, 1994.

ных, нац. чэмпіянатаў, кубкавых турніраў.

А.в.с. могуць стаць тыя спарт. дысцыпліны, якія пашыраны не менш як у 40 краінах 3 кантынентаў у спаборніцтвах мужчын і не менш як у 25 краінах 2 кантынентаў у спаборніцтвах жанчын — для летніх Алімпійскіх гульняў, не менш як у 25 краінах 2 кантынентаў (мужчыны) і 20 краінах (жанчыны) — для *зімовых Алімпійскіх гульняў*. Як выключэнне да А.в.с. традыц. адносіцца *бобслей*.

**АЛІМПІ́ЙСКІЯ ГУ́ЛЬНІ**, 1) агульнаэлінскія святкаванні і спарт. спаборніцтвы ў Стараж. Грэцыі. Адбываліся раз у 4 гады ў *Алімпіі* ў гонар бога Зеўса. Звестак пра першыя А.г. не захавалася, іх адлік вядзецца ад 776 да н.э., калі былі ўведзены запіс пераможцаў і нумарацыя *Алімпіяд*. Складаліся з культавых абрадаў і спарт. спаборніцтваў. Удзельнічалі прадстаўнікі ўсіх грэч. дзяржаў. На час А.г. абвяшчаўся абавязковы для ўсіх грэкаў «свяшчэнны мір» і не вяліся ваен. дзеянні. Да спаборніцтваў дапускаліся толькі вольнанароджаныя грэкі (пазней і рымляне) і толькі мужчыны. Кіравалі гульнямі эланодыкі (суддзі). Спаборніцтвы праводзіліся спачатку па бегу на 1 стадый (дыстанцыя, роўная даўжыні стадыёна — 197,27 м), затым на 2 і больш стадыі; з 708 да н.э. — таксама па барацьбе, пенталоне (пяцібор'е — бег, кіданне дыска і кап'я, скачкі ў даўжыню, барацьба), кулачным баі, гонках на калясніцах і інш. Пераможцаў А.г. (алімпіёнікаў) узнагароджвалі аліўкавым вянком, іх ушаноўвалі як нац. герояў на радзіме і па ўсёй Грэцыі (атрымлівалі сац. і паліт. прывілеі), часам абагаўлялі, у іх гонар ставілі статуі, чаканілі манеты. А.г. праводзіліся і пасля падпарадкавання грэч. зямель Рыму. Пасля ўсталявання хрысціянства А.г. як праява паганства забаронены ў 394 н.э. рым. імператарам Феадосіем I. 2) Буйнейшыя міжнар. комплексныя спарт. спаборніцтвы сучаснасці. Праводзяцца з 1896 кожны высакосны год летам паводле правілаў і палажэнняў, вызначаных *Алімпійскай хартыяй*. Праграмныя і арганізац. асновы А.г., як і ўсяго *алімпійскага руху*, закладзены П. дэ *Кубертэнам*. Па яго ініцыятыве Парыжскі міжнар. спарт. кангрэс (1894) прыняў рашэнне пра аднаўленне А.г. Арганізуе і праводзіць гульні *алімпійскі горад* і *нацыянальны алімпійскі камітэт* (НАК) краіны, у якой горад знаходзіцца, пад кіраўніцтвам і кантролем *Міжнароднага алімпійскага камітэта* (МАК). Парадкавы нумар А.г. захоўваецца незалежна ад таго, праводзіліся яны ці не (гл. табл.). Праграма А.г. уключае не менш як 15 *алімпійскіх відаў спорту* (абавязкова — лёгкая атлетыка, гімнастыка, плаванне, цяжкая атлетыка, барацьба, бокс, фехтаванне, веславанне, веласпорт, футбол, баскетбол). Арганізатары гульняў могуць уключаць і паказальныя выступленні па 1—2 відах спорту, не прызнаных МАК. На час А.г. удзельнікі размяшчаюцца ў *алімпійскай вёсцы*. Сярод традыц. рытуалаў А.г. — запальванне алімпійскага агню ў час адкрыцця гульняў (агонь, запалены ў стараж. Алімпіі ад сонечных промняў, эстафетай спартсменаў дастаўляецца ў алімпійскі горад), алімпійская клятва, якую ад імя ўсіх удзельнікаў прамаўляе адзін з лепшых спартсменаў краіны правядзення А.г., клятва суддзяў, узнагароджанне пераможцаў і прызёраў спаборніцтваў алімпійскімі медалямі, узняцце дзярж. сцяга і выкананне нац. гімна ў гонар пераможцы. З 1908 на А.г. пашыраны т.зв. неафіц. агульнакамандны залік — вызначэнне месца нац. камандаў па колькасці медалёў і заліковых

Да арт. **Алімпійскія гульні**. Алімпійскі агонь на вуліцах Мінска. 1980.

Пачынаючы з 1924 праводзяцца і *зімовыя Алімпійскія гульні*, якія маюць уласную нумарацыю і адбываліся да 1994 у адзін год з летнімі. Апрача агульнай *алімпійскай сімволікі* А.г. маюць і ўласную (эмблемы, талісманы і г.д.). ачкоў. А.г. спадарожнічае пэўная культ. праграма, выпускаюцца алімпійскія сувеніры, манеты, значкі, маркі і інш. атрыбутыка.

Бел. спартсмены ўдзельнічаюць у А.г. з 1952 у складзе зборнай каманды СССР, аб'яднанай каманды СНД



Да арт. **Алімпійскія гульні**. Старт фінальнага забегу на 100 м на гульнях 1-й Алімпіяды (1896).

Да арт. **Алімпійскія гульні**. Спаборніцтва па стральбе з пісталета на гульнях 5-й Алімпіяды (1912).

**Алімпійскія гульні**

| Алімпіяды | Год правядзення | Месца правядзення | Прадстаўленыя нац. алімпійскія к-ты |
|---|---|---|---|
| I | 1896 | Афіны | 13 |
| II | 1900 | Парыж | 21 |
| III | 1904 | Сент-Луіс | 12 |
| IV | 1908 | Лондан | 22 |
| V | 1912 | Стакгольм | 28 |
| VI | 1916 | Берлін* | |
| VII | 1920 | Антверпен | 29 |
| VIII | 1924 | Парыж | 44 |
| IX | 1928 | Амстэрдам | 46 |
| X | 1932 | Лос-Анджэлес | 38 |
| XI | 1936 | Берлін | 49 |
| XII | 1940 | Токіо, пасля адмовы — Хельсінкі* | |
| XIII | 1944 | Лондан* | |
| XIV | 1948 | Лондан | 58 |
| XV | 1952 | Хельсінкі | 69 |
| XVI | 1956 | Мельбурн | 67 |
| XVII | 1960 | Рым | 84 |
| XVIII | 1964 | Токіо | 94 |
| XIX | 1968 | Мехіко | 113 |
| XX | 1972 | Мюнхен | 122 |
| XXI | 1976 | Манрэаль | 88 |
| XXII | 1980 | Масква** | 81 |
| XXIII | 1984 | Лос-Анджэлес | 140 |
| XXIV | 1988 | Сеул | 160 |
| XXV | 1992 | Барселона | 172 |
| XXVI | 1996 | Атланта | |

* Гульні не праводзіліся ў сувязі з ваеннымі дзеяннямі.
** Адзін з групавых турніраў Алімпіяды па футболе праводзіўся ў Мінску.

(1992), з 1994 (зімовыя А.г. ў Лілехамеры) — самастойнай нац. камандай. Імі заваявана (у т.л. і на зімовых А.г.) 81 залаты, 39 сярэбраных і 36 бронзавых медалёў. Шматразовымі алімпійскімі чэмпіёнамі былі гімнасты С.*Багінская*, В.*Корбут*, В.*Шчэрба* (6 залатых медалёў на А.г. у Барселоне), фехтавальшчыкі А.*Бялова*, Т.*Самусенка* і В.*Сідзяк*, барэц А.*Мядзведзь*, вясляр У.*Парфяновіч* і інш.

*Літ.:* Олимпийская энциклопедия. М., 1980.
*І.К. Кісялёў.*

**АЛІМПІ́ЙЦЫ**, у старажытнагрэчаскай міфалогіі багі, якія жылі на *Алімпе*. Паводле міфаў, дзеці бога *Кронаса* на чале з *Зеўсам* паўсталі супраць бацькі і *тытанаў*, перамаглі ў гэтай барацьбе і замацаваліся на Алімпе, падзяліўшы паміж сабой уладу над светам. Вярх. уладыкам стаў Зеўс. А. былі абыякавыя да зямных пакут і хваляванняў. Адсюль пераноснае значэнне слова А. — людзі, якія захоўваюць непарушны («алімпійскі») спакой у любых жыццёвых сітуацыях.

**АЛІ́МПІЯ** (Olympia), старажытнагрэчаскі горад на ПнЗ п-ва Пелапанес, на р. Алфей. Рэліг. цэнтр стараж. грэкаў, месца культу *Зеўса* і правядзення *Алімпійскіх гульняў*. Буйны цэнтр мастацтваў (7—4 ст. да н.э.). У канцы 7 ст. да н.э. пабудаваны храм Геры і 12 скарбніц на шляху да храма. Гал. частка

Да арт. **Алімпійскія гульні.** Беларуская гімнастка В.Корбут — уладальніца 3 залатых медалёў на гульнях у Мюнхене (1972).

арх. ансамбля — храм Зеўса (468—456 да н.э., арх. Лібан), дзе знаходзілася вялізная статуя Зеўса з золата і слановай косці (скульпт. Фідый), залічаная грэкамі да аднаго з 7 дзівосаў свету.

Сярод арх. помнікаў: будынак савета (булеўтэрый, 6 ст. да н.э., перабудаваны ў 5 ст. да н.э.), храм Маці багоў (1-я пал. 4 ст. да н.э.), свяцілішча Пелапса, гімнасій і інш. З усталяваннем хрысціянства А. заняпала, у 426 н.э. спалена па загадзе рым. імператара Феадосія II. У час раскопак (вядуцца з 1829) выяўлена больш за 130 статуй, каля 13 тыс. бронзавых прадметаў, да 10 тыс. надпісаў на бронзавых таблічках і інш.

Да арт. **Алімпія.** Рэшткі храма Геры.

**АЛІМПІ́ЯДА** [грэч. Olympias (Olympiados)], 1) у старажытных грэкаў 4-гадовы прамежак паміж *Алімпійскімі гульнямі*. Годам 1-й А. лічыцца 776 да н.э., з якога пачалі весці спісы пераможцаў гульняў. Каля 264 да н.э. гісторык Тымей упершыню выкарыстаў А. для летазлічэння. Гэтым метадам карысталіся таксама стараж. гісторыкі Палібій, Дыядор Сіцылійскі і інш. Летазлічэнне па А. вялося да адмены Алімпійскіх гульняў (394 н.э.). 2) Тое, што *Алімпійскія гульні*. 3) Каманднае першынство свету па шахматах ці міжнар. шашках. Сусв. шахматныя А. праводзяцца з 1927 Міжнар. федэрацыяй шахмат (ФІДЭ), па міжнар. шашках — з 1986 Сусв. федэрацыяй шашак (ФМЖД). 4) У СССР у 1920—40-я г. назва аглядаў, конкурсаў маст. самадзейнасці, нар. творчасці. 5) Спаборніцтвы навучэнцаў у выкананні пэўных заданняў у вызначаных галінах ведаў — А. па фізіцы, матэматыцы, мове і г.д.

**А́ЛІНГ-ГА́НГРЫ**, Наін-Сінга, горны хрыбет на ПдЗ Тыбецкага нагор'я, найвыш. ў сістэме Гандзісышань, у Кітаі. Даўж. каля 600 км. Выш. да 7315 м (г. Алінг-Гангры). Складзены з гранітаў, сланцаў, кварцытаў. Грэбень хрыбта альпійскага тыпу. Ландшафты высакагорных пустыняў. Вышэй за 4500 м — вечныя снягі і ледавікі. На паўд. схілах А.-Г. бярэ пачатак вытак Інда — р. Сінгі.

**АЛІ́НДА** (Olinda), горад на ПнУ Бразіліі, у штаце Пернамбуку. Засн. ў 1536. 335,9 тыс. ж. (1985). Чыг. станцыя. Харч., тэкст., гарбарна-абутковая прам-сці. Кліматычны курорт. Цэнтр турызму. Арх. помнікі 16—18 ст.

**АЛІ́НФ** (Olynthos), старажытнагрэчаскі горад на п-ве Халкідыкі (захаваліся рэшткі за 50 км на Пд ад г. Салонікі). Засн. ў 8—6 ст. да н.э. выхадцамі з г. Халкіда (в-аў Эўбея). З 432 да н.э. — цэнтр саюза халкідскіх гарадоў, які супрацьстаяў Афінам. У выніку Алінфскай вайны разбураны ў 348 македонскім царом Філіпам II, пасля не аднаўляўся. Раскопкамі выяўлены жылыя кварталы класічнага перыяду. У т.зв. віле «Добрага лёсу» і «Доме класічнага акцёра» (5—4 ст. да н.э.) знойдзены шматкаляровыя мазаікі, багатая калекцыя побытавых рэчаў.

**АЛІ́-ПАША́ ТЭПЕЛЕ́НСКІ** (Ali Pashë Tepelena), Алі-паша Янінскі (каля 1744, г. Тэпелена, Албанія — 5.2.1822), албанскі феадал, правіцель (з 1787) на значнай тэр. Балканскага п-ва (уключала ч. тэр. Албаніі і Грэцыі, цэнтр г. Яніна). Дамогся ад тур. султана фактычнай незалежнасці, меў армію і

флот. У ліп. 1820 тур. султан Махмуд II пачаў супраць яго вайну. А.-п. Т. быў забіты, а дзяржава яго распалася.

**АЛІСЕ́ЙКА** Уладзімір Цітавіч (22.2.1921, в. Косетаў Калінкавіцкага р-на Гомельскай вобл. — 9.5.1981), Герой Сав. Саюза (1944). З сак. 1943 на Волхаўскім, 1-м Украінскім, 1-м і 2-м Беларускіх франтах. Камандзір сапёрнага ўзвода ст. сяржант А. ў 1943 пры фарсіраванні Дняпра каля Кіева захапіў плацдарм на правым беразе ракі, разміраваў яго, што садзейнічала паспяховай пераправе сав. войскаў. Удзельнік вызвалення Польшчы, штурму Берліна.

**АЛІ́СУМ**, гл. *Бурачок*.

**АЛІТАВА́ННЕ** (ад ням. alitieren алітаваць), дыфузійнае насычэнне паверхні метал. вырабаў алюмініем, разнавіднасць *алюмінавання*. Выкарыстоўваецца для аховы сталяў, чыгуну, гарачатрывалых сплаваў на аснове нікелю і кобальту ад акіслення пры высокіх т-рах (да 1100 °С), змяншэння схоплівання паверхняў (напр., разьбовых злучэнняў пры эксплуатацыі ў вакууме), павышэння зносаўстойлівасці металаў.

**АЛІТУ́С** (Alytus), горад у Літве, на р. Нямунас. Вядомы з 14 ст. 71 тыс. т. (1987). Чыг. станцыя. Прадпрыемствы машынабудавання, тэкст., камбікормавай і харч. прам-сці; вытв-сць буд. матэрыялаў. Краязнаўчы музей.

**АЛІ́ТЫ** [ад *ал(юміній)* + *...літ*(ы)], 1) прадукты выветрывання, складзеныя пераважна з гідравакіслаў алюмінію. 2) Гліністыя пароды, у якіх гліназёму больш, чым крэменязёму; прамежкавыя паміж глінай і баксітамі. Магчымая сыравіна для вытв-сці алюмасілікатных вогнетрывалых вырабаў.

**АЛІТЭРА́ЦЫЯ** (ад лац. ad да, пры + littera літара), адзін са спосабаў гукавой арганізацыі маўлення, паўтарэнне аднолькавых або падобных зычных гукаў. Словы, звязаныя А., вылучаюцца ў моўнай плыні, набываюць пэўную інтанацыйную значнасць. Як стыліст. прыём А. выкарыстоўваецца з даўніх часоў у вуснапаэт. і літ. разнавіднасцях маст. мовы (пераважна ў паэзіі).

На А. пабудаваны многія прыказкі і прымаўкі («Дружба дружбай, а служба службай»), скорагаворкі («Пекар Пётр пёк пірог»). Праслейшы від А. — гукаперайманне, але ў чыстым выглядзе яно выступае рэдка, часцей служыць першаасновай для далейшых гукавых асацыяцый («Шурхатала трава затоеным шэптам: «Ш-ш-ш... с-с-с...» З.Бядуля). А. звычайна спалучаецца з *асанансам*.

**АЛІЎЭ́** (Olivier) Лорэнс Кер (22.5.1907, Доркінг, графства Сурэй, Вялікабрытанія — 11.7.1989), англійскі акцёр, рэжысёр тэатра і кіно. Вучыўся ў Цэнтр. школе дэкламацыі і драм. мастацтва ў Оксфардзе (1924—25). На сцэне з 1922, у кіно з 1930. З 1926 выступаў у рэпертуарных т-рах Англіі, у т.л. ў «Олд Вік» (з 1937, у 1944—49 яго кіраўнік), у 1963—73 у Нац. т-ры (Лондан, дырэктар т-ра). Ставіў п'есы У.Шэкспіра, творы класічнай і сучаснай драматургіі. Адзін з лепшых выканаўцаў цэнтр. роляў у п'есах Шэкспіра «Гамлет», «Рычард III», «Генрых V» (усе і ў кіно, у апошнім — акцёр, рэжысёр і сцэнарыст), «Карыялан», «Кароль Лір», «Макбет», «Атэла» і інш. Сярод інш. работ у кіно: адмірал Нельсан («Лэдзі Гамільтан»), «Гры сястры» паводле А.Чэхава (рэжысёр).

*Літ.:* Юткевич С. Шекспир и кино. М., 1973; Липков А. Шекспировский экран. М., 1975.

**АЛІ́ЎКАВАЕ ДРЭ́ВА**, гл. *Масліна*.

**АЛІ́ЎКАВАЯ ПЛЯ́МІСТАСЦЬ**, хвароба раслін, якая выклікаецца грыбам з роду кладаспорый. Узбуджальнік — кладаспорый агурковы (Cladosporium cucumerinum; пашкоджвае ўсю расліну ў цяпліцы і ў адкрытым грунце). На пладах (радзей чаранках і сцёблах) з'яўляюцца масляністыя плямы, якія ператвараюцца ў светла-карычневыя язвачкі са спаранашэннем грыба аліўкавага колеру. На лісці ўтвараюцца бурыя плямы. Хварэюць на А.п. пераважна агуркі, кабачкі, гарбузы, дыні, кавуны, патысоны. Пашкоджаныя плады трацяць таварныя якасці, маладая завязь гіне. Развіццю хваробы спрыяюць рэзкія перапады тэмпературы, высокая вільготнасць. Меры барацьбы: зніжэнне хворых пладоў, падтрыманне т-ры паветра ў цяпліцах не ніжэй за 17 °С, зніжэнне вільготнасці паветра да 70%.

**АЛІ́ЎКАВЫ АЛЕ́Й**, прованскі алей, алей з мякаці аліў (гл. *Масліна*). Вадкасць ад светла-жоўтага да карычневага колеру, t застывання ад -2 да -6 °С, шчыльн. 0,91—0,918·10$^3$ кг/м$^3$, невысыхальны алей. Мае ў сабе тлустыя кіслоты: насычаныя 9—20% (пераважна пальміцінавая), алеінавую 54—81%, лінолевую 15%. Выкарыстоўваецца як харч. прадукт, сыравіна ў вытв-сці спец. тэкст. мыла; кампанент змазвальных матэрыялаў, касметычных сродкаў, раствораў вітамінаў і прэпаратаў для ін'екцый.

**АЛІ́ЎСКІ МІР 1660**, мірны дагавор паміж Швецыяй і Рэччу Паспалітай з яе саюзнікамі Аўстрыяй і Брандэнбургам. Падпісаны 3.5.1660 у Аліўскім манастыры паблізу Гданьска пры пасрэдніцтве Францыі. Завяршыў (разам з *Капенгагенскім мірам 1660*) *Паўночную вайну 1655—60*. Паводле А.м. кароль Рэчы Паспалітай Ян II Казімір адмовіўся ад прэтэнзій на швед. карону. Швецыя замацавала за сабой Эстляндыю з в-вам Эзель і амаль усю Ліфляндыю, захопленыя ёй у 16 — пач. 17 ст.

**АЛІФАТЫ́ЧНЫЯ ЗЛУЧЭ́ННІ**, гл. ў арт. *Ацыклічныя злучэнні*.

**АЛІХА́НАЎ** Абрам Ісакавіч (4.3.1904, Тбілісі — 8.12.1970), сав. фізік. Акад. АН СССР (1943). Герой Сац. Працы (1954). Скончыў Ленінградскі політэхн. ін-т (1929). У 1927—41 у Фізіка-тэхн. ін-це, у 1945—68 дырэктар Ін-та тэарэт. і эксперым. фізікі АН СССР. Навук. працы па рэнтгенаструктурным аналізе, фізіцы рэнтгенаўскіх і касм. прамянёў і ядз. фізіцы. Адкрыў і даследаваў (у сааўт.) выпрамяненне электронна-пазітронных пар, распрацаваў арыгінальную методыку даследавання спектраў электронаў; пазітронаў і γ-квантаў; адзін са стваральнікаў першага ў СССР доследнага цяжкаводнага рэактара. Дзярж. прэміі СССР 1941, 1948, 1953.

*Тв.:* Избр. труды. М., 1975.

**АЛІХАНЯ́Н** Ісак Сямёнавіч (7.2.1876, Душэты, Грузія — 15.3.1946), армянскі акцёр. Нар. арт. Арменіі (1923) і Грузіі (1941). З 1897 працаваў у Баку, Тбілісі, Растове-на-Доне. Адзін з арганізатараў (1921) 1-га Дзярж. т-ра Арменіі ў Ерэване (цяпер Т-р імя Г.Сундукяна). З 1922 у Тбіліскім арм. т-ры. Сярод роляў: Пэпа (аднайм. п'еса Сундукяна), Элізбараў («З-за гонару» А.Шырванзадэ), Хлестакоў («Рэвізор» М.Гогаля), Пратасаў («Жывы труп» Л.Талстога), Нязнамаў («Без віны вінаватыя» А.Астроўскага).

**АЛІЦЫКЛІ́ЧНЫЯ ЗЛУЧЭ́ННІ**, арганічныя злучэнні, малекулы якіх змяшчаюць адзін або некалькі цыклаў з атамаў вугляроду (акрамя *араматычных*



*злучэнняў*). Падзяляюцца на класы і гамалагічныя шэрагі па колькасці і будове цыклаў, наяўнасці кратных сувязяў і функцыян. груп у малекуле. Монацыклічныя злучэнні па колькасці атамаў вугляроду ў цыкле бываюць малыя (3—4), звычайныя (5—7), сярэднія (8—12) і макрацыклы (больш за 12) А.з. з некалькімі цыкламі — бі-, тры- і поліцыклічныя. Апошнія могуць быць ізаляваныя (I), сучлененыя (II), мець адзін, два, тры і больш агульных атамаў вугляроду, адпаведна спіраны (III), кандэнсаваныя (IV), мосцікавыя (V), поліэдрычныя злучэнні (VI). Наяўнасць цыкла ў малекуле адбіваецца на фіз. і хім. уласцівасцях А.з. у параўнанні з *ацыклічнымі злучэннямі* з той жа колькасцю атамаў вугляроду (больш высокія паказчыкі пераламлення, шчыльнасці, т-ры кіпення; больш высокая рэакцыйная здольнасць, асабліва малых цыклаў). А.з. сустракаюцца ў нафце; як структурныя фрагменты ўваходзяць у састаў многіх прыродных злучэнняў: тэрпеноідаў, стэроідаў, інсектыцыдаў, вітамінаў, антыбіётыкаў. Найб. практычнае выкарыстанне мае цыклагексан, яго гамолагі і вытворныя.

**АЛІША́Н** Гевонд (18.7.1820, г. Стамбул — 22.11.1901), армянскі паэт, гісто-

рык і мысліцель. Адукацыю атрымаў у кангрэгацыі арм. царкоўнікаў-*мхітарыстаў* у Венецыі. У зб. «Песнапенне» (т. 1—5, 1857—58) апаэтызаваў прыроду роднага краю, подзвіг народа ў барацьбе супраць чужаземных захопнікаў. Родапачынальнік рамант. кірунку ў арм. паэзіі (цыкл вершаў «Песні Патрыярха»). Аўтар фундаментальных даследаванняў па гістарыяграфіі, археалогіі, філалогіі, геаграфіі і этнаграфіі Арменіі, рэліг.-філас. трактатаў, кн. «Успаміны пра радзіму армян» (т. 1—2, 1869—70).

*С.Сарынян.*

**А́ЛІШАЎ** Япанчэ Вагізавіч (н. 24.11.1925, г. Чыстапаль, Рэспубліка Татарстан), вучоны ў галіне оптаэлектронікі. Д-р тэхн. н., праф. (1985). Скончыў Харкаўскае вышэйшае авіяц.-інж. вучылішча (1958). З 1963 у ВНУ г. Харкаў, з 1973 у Бел. дзярж. ун-це інфарматыкі і радыёэлектронікі. Навук. працы па аптычнай лакацыі і сувязі, лазерных сістэмах кіравання аб'ектамі, валаконна-аптычных тэлекамунікацыйных сістэмах.

*Тв.:* Многоканальные системы передачи оптического диапазона. Мн., 1986.

**АЛКАГАЛІ́ЗМ**, алкагалізм хранічны, хвароба, якая ўзнікае ад празмернага і частага ўжывання спіртных напіткаў; выяўляецца ў псіхічнай і фізічнай залежнасці ад алкаголю, сацыяльнай і маральнай дэфармацыі асобы, у псіх., неўралагічных і саматычных расстройствах. Развіваецца часцей у 25—40 гадоў. Адзначаецца і спадчынная схільнасць. Першая стадыя хваробы на фоне працяглага быт. п'янства цягнецца 3—6 гадоў. Характарызуецца стратай ірвотнага рэфлексу, псіх. залежнасцю (неабходнасць спіртнога, каб палепшыць настрой або зняць напружанне), стратай колькаснага кантролю над выпітым, ап'яненнем з частковым забыванием падзей. Асн. асаблівасць другой стадыі — фізічная залежнасць з пахмельным сіндромам, пры якім узнікаюць цяжкія псіх. і самата-вегетатыўныя пераживанні. Каб палепшыць стан, хворы пахмяляецца. Могуць быць і *алкагольныя псіхозы*. Адзначаны таксама змены асобы з сац. дэградацыяй, парушэннямі ўвагі, памяці. На трэцяй стадыі хворы п'янее ад нязначнай дозы спіртнога, часта пераходзіць на сурагаты. Адсутнічаюць усе формы кантролю, хворы становіцца бесклапотным і лагодным. Узнікаюць неўралагічныя расстройствы, пагаршаецца агульны стан здароўя. Лячэнне: выпрацоўка адмоўнай рэакцыі на алкаголь з дапамогай лякарстваў, псіхатэрапія і інш.

Сістэма барацьбы з п'янствам і А. у Рэспубліцы Беларусь уключае комплекс выхаваўчых, санітарна-асветных, адм. і мед. мерапрыемстваў, якія спалучаюцца з мерамі грамадскага і дзярж. ўздзеяння супраць тых, хто не жадае выконваць маральныя і прававыя ўстанаўленні грамадства. Паводле дзеючага заканадаўства асобы, якія ўчынілі ў стане ап'янення правапарушэнні і злачынствы, не вызваляюцца ад адм. ці крымін. адказнасці. Учыненне злачынства ў стане ап'янення лічыцца акалічнасцю, якая абцяжвае адказнасць. Да хранічнага алкаголіка, які ўчыніў злачынства, адначасова з пакараннем за яго суд можа прызначыць яму прымусовае лячэнне ад А. Асоба, якая ў выніку злоўжывання алкаголем ставіць сваю сям'ю ў складанае матэрыяльнае становішча, па рашэнні суда можа быць абмежавана ў *дзеяздольнасці*, і над ёю ўстанаўляецца апякунства.

*Ф.М.Гайдук, Г.А.Маслыка.*

**АЛКАГАЛЯ́ТЫ**, прадукты замяшчэння металам атама вадароду гідраксільнай групы спіртоў, M $(OAlk)_n$ (n — ступень акіслення металу). А. шчолачных і шчолачна-зямельных металаў першасных і другасных спіртоў — іонныя злучэнні, растваральныя ў спіртах і аміяку, іх растворы электраправодныя, няўстойлівыя ў прысутнасці вады, вуглякіслага газу, кісларода. А. металаў III—VIII групы — кавалентныя злучэнні, гіраскапічныя, лятучыя, нізкаплаўкія, растваральныя ў арган. растваральніках. Выкарыстоўваюць як каталізатары, алкаксільныя рэагенты, для атрымання асабліва чыстых аксідаў і гідраксідаў металаў.

**АЛКАГО́ЛІ**, гл. ў арт. *Спірты*.

**АЛКАГО́ЛЬНЫЯ НАПІ́ТКІ**, спіртныя напіткі, напіткі, у састаў якіх уваходзіць алкаголь (*этылавы спірт*). Моцныя А.н.: *гарэлка, каньяк*, джын, *віскі, ром, наліўкі, настойкі, лікёры* — маюць ад 60 да 20% спірту, *віно* вінаграднае і пладова-ягаднае — ад 20 да 9% (гл. табл.). Змешаныя А.н. гатуюць непасрэдна перад ужываннем (кактэйлі, крушоны, глінтвейны); у залежнасці ад рэцэптаў прыгатавання маюць розную колькасць алкаголю. Да слабых А.н. адносіцца *піва*.

**Класіфікацыя алкагольных напіткаў**

| Алкагольныя напіткі | Колькасць | |
|---|---|---|
| | спірту, % | цукру (г/100 мл) |
| Спірт этылавы рэктыфікацыйны | 95,5—96,8 | — |
| Каньякі | 40—57 | 0,7—1,5 |
| Гарэлка | 40—56 | 0,1—0,2 |
| Віскі | 50—52 | — |
| Джын | 44—45 | — |
| Ром | 40—60 | 1,5—2,0 |
| Вінаграднае віно | 9—20 | 0—32 |
| Пладова-ягаднае віно | 9—20 | 0—20 |
| Лікёры | 25—45 | 32—50 |
| Настойкі | 16—40 | 4—30 |
| Наліўкі | 18—20 | 28—40 |
| Настойкі горкія і бальзамы | 30—60 | — |

Для прыгатавання А.н. выкарыстоўваюцца спірт вышэйшага гатунку, памякчаная вада, часам сокі фруктаў і ягад, эсенцыі ягадныя і фруктовыя (пераважна штучныя), настоі духмяных траў, карэнняў, лісця, кветак, лупіны цытрусавых, вострыя прыправы. Тэхналогія прыгатавання моцных А.н. уключае разбаўленне, моцнага віна — дабаўленне спірту да патрэбнага моцнуку. У сталовым сухім белым ці чырв. віне спірт толькі натуральнага збраджвання. А.н. аказваюць на чалавека дзеянне ад танізавальнага да разбуральнага, з дэградацыяй асобы пры *алкагалізме*.

**АЛКАГО́ЛЬНЫЯ ПСІХО́ЗЫ**, вострыя, зацяжныя і хранічныя псіхічныя расстройствы ад хранічнага *алкагалізму*. Найб. частая форма — алкагольны дэлірый (белая гарачка) узнікае, калі раптоўна спыніць прыём алкаголю. Пачынаецца з бяссоніцы і трывожнага настрою. Пазней з'яўляюцца зрокавая і слыхавая галюцынацыі; хворыя бачаць насякомых і дробных жывёл. Гэта выклікае страх і рухальны неспакой. Хвароба цягнецца некалькі дзён. Пры адсутнасці лячэння часта прыводзіць да смерці. Хворыя сацыяльна небяспечныя. Востры алкагольны галюцыноз і алкагольны параноід развіваецца таксама на фоне пахмельнага сіндрому і дэпрэсіўна-трывожнага настрою, але галюцынацыі слыхавыя: хворы «чуе» асуджальныя, абразлівыя або пагражальныя галасы. Параноід часцей бывае ў выглядзе алкагольнага трызнення рэўнасці. Пры энцэфалапатыі Гае—Верніке да псіх. расстройстваў далучаюцца неўралагічныя і саматычныя парушэнні. Пры хранічных алкагольных галюцынозах слыхавыя галюцынацыі (хворы да іх прывыкае і часам ставіцца крытычна) цягнуцца многія гады, нават пры цвярозым ладзе жыцця. Корсакаўскі псіхоз (хвароба ўпершыню апісана рус. псіхіятрам С.С.Корсакавым) характарызуецца значнымі парушэннямі памяці і полінеўрытам (запаленнем перыферычных нерв. ствалоў).

*Ф.М.Гайдук.*

**АЛКАЛО́ІДЫ** (ад позналац. alcali шчолач + грэч. eidos від), група прыродных азотазмяшчальных злучэнняў, пераважна раслінная паходжання. Адкрыты ў пач. 19 ст.

Першы выдзелены морфій (марфін) з опію (1806), потым стрыхнін і бруцын, хінін і цынханін, кафеін, нікацін, атрапін і інш. У аснове будовы малекул А. ляжыць гетэрацыкл ядра пірыдзіну, піралідзіну, імідазолу, аўрыну і інш. У залежнасці ад будовы А. класіфікуюць на групы: пірыдзіну (лабелін, нікацін, канін), трапану (атрапін, какаін), хіналізідзіну (лупінін, цытызін) і інш.

Вядома некалькі тысяч А., з іх у жывёл толькі каля 50. Найб. багатыя А. расліны з сям. бабовых, макавых, паслёнавых, казяльцовых, астравых, лебядовых. Колькасць А. у тканках раслін звычайна вымяраецца долямі працэнта, рэдка дасягае 10—15% (кара хіннага дрэва). Асобныя А. спецыфічныя для пэўных родаў і сямействаў раслін, што з'яўляецца іх дадатковай сістэматычнай

прыкметай. Лакалізуюцца А. ў органах раслін, напр., у хіннага дрэва ў кары, у аканіта ў клубнях, у какаінавага дрэва ў лісці. Многія з А. у вял. дозах — моцныя яды, у малых — лек. рэчывы (шырока выкарыстоўваюцца ў фармацэўтычнай прам-сці, напр., атрапін, новакаін, кадэін, папаверын, хінін і інш.). Арганізм чалавека і жывёл яны ўзбуджаюць (кафеін, стрыхнін) або паралізуюць (марфін, рэзерпін). Некаторыя А. выкарыстоўваюць у сельскай гаспадарцы супраць шкоднікаў раслін (напр., анабазін, нікацін і іх серакіслыя солі) і ў эксперым. біялогіі для вывядзення новых формаў с.-г. раслін (напр., калхіцын).

*Літ.:* Орехов А.П. Химия алкалоидов растений СССР. М., 1965; Мироненко А.В. Методы определения алкалоидов. Мн., 1966; Лукнер М. Вторичный метаболизм у микроорганизмов, растений и животных: Пер. с англ. М., 1979.

**АЛКАМЕ́Н** (Alkamenēs), старажытнагрэчаскі скульптар 2-й пал. 5 ст. да н.э. Працаваў у Афінах. Вучань *Фідыя*, ад якога пераняў прынцып адзінай пластычнай трактоўкі цела і вопраткі («Афрадыта ў садах», копія). Захаваліся копіі статуі Гермеса Прапілейскага, скульпт. група «Прокна і Ітыс».

**АЛКАНО́СТ**, алканос, у рускіх і візантыйскіх сярэдневяковых легендах казачная птушка з тварам чалавека. Вобраз А. паходзіць ад стараж.-грэч. міфа пра Алкіёну, жонку фесалійскага цара Кеіка, якая была ператворана багамі ў птушку алкіён (зімародак). А. нясе яйкі на беразе мора, апускае іх у мора і робіць яго спакойным на 6 дзён. Той, хто пачуе дзівосныя спевы А., забывае пра ўсё на свеце.

**АЛКА́НЫ**, насычаныя ацыклічныя вуглевадароды, гл. ў арт. *Насычаныя злучэнні*.

**АЛКЕ́ЕВА СТРАФА́**, страфа антычнага вершаскладання з 4 радкоў-лагаэдаў. Уведзена стараж.-грэч. паэтам Алкеем (канец 7 — пач. 6 ст. да н.э.), удасканалена Гарацыем.

**АЛКЕ́НЫ**, алефіны, этыленавыя вуглевадароды, ненасычаныя ацыклічныя вуглевадароды з адной двайной сувяззю C=C. Гл. таксама *Ненасычаныя злучэнні*.

**АЛКІВІЯ́Д** (Alkibiadēs; каля 450—404 да н.э.), старажытнаафінскі паліт. і ваен. дзеяч. Сваяк і выхаванец *Перыкла*, вучань *Сакрата*. Вызначаўся частай зменай паліт. арыентацыі. У час *Пелапанескай вайны* 431—404 неаднаразова выбіраўся стратэгам. У 415 адзін з арганізатараў і кіраўнікоў ваен. экспедыцыі супраць *Сіракузаў*. Абвінавачаны ў разбурэнні гермаў (статуй Гермеса), уцёк у Спарту (садзейнічаў ёй у барацьбе з Афінамі), адтуль у Персію. У 411 падтрымаў алігархічны, пазней дэмакр. ўрады ў Афінах. На чале афінскага флоту перамог спартанцаў каля Абідаса (411) і Кізіка (410). З трыумфам вярнуўся ў Афіны і абраны гегемонам. Пасля паражэння афінскага флоту ў баях са спартанцамі (408—407) уцёк у Фракію, потым ў Персію, дзе быў забіты.

**АЛКІ́ДНЫЯ ЛА́КІ**, гл. ў арт. *Алкідныя смолы*.

**АЛКІ́ДНЫЯ СМО́ЛЫ**, тэрмарэактыўныя і тэрмапластычныя *смолы*, якія атрымліваюцца пры кандэнсацыі полікарбонавых кіслот, поліспіртоў і вышэйшых монакарбонавых кіслот (пераважна аліфатычных кіслот алеяў). Найб. пашыраныя гліфталевыя (на аснове фталевага ангідрыду і гліцэрыны) і пентафталевыя (на аснове фталевага ангідрыду і пентаэрытрыту). Ліпкія, высакавязкія рэчывы з мал. масай 1500—5000 растваральныя ў талуоле, уайт-спірыце, сальвент-нафце; нізкамалекулярныя разбаўляюцца вадой. Тэрмарэактыўныя (высыхальныя) змяшчаюць дэгідратаваныя вытворныя рыцыны, ільняны і тунгавы алеі; тэрмапластычныя (невысыхальныя) — какосавы алей ці сырую рыцыну. Адрозніваюцца па тлустасці, маюць да 34—70% алею.

Алкамен. Прокна і Ітыс. 2-я пал. 5 ст. да н.э.

А.с. — аснова алкідных лакаў (канцэнтрацыя 40—60%, змяшчаюць таксама *сікатывы, адвярджальнікі*, растваральнікі і інш. плёнкаўтваральнікі). Выкарыстоўваюцца як кампаненты фарбаў для аўтамабіляў, розных прылад і прамысл. абсталявання, скуры; у выт-сці клеяў, друкарскіх фарбаў.

**АЛКІ́ЛІ**, абагульненая назва аднавалентных радыкалаў насычаных аліфатычных вуглевадародаў. Напр., метыл — астатак метану ($CH_3$), этыл — астатак этану ($C_2H_5$), прапіл — астатак прапану [$CH_3{\cdot}(CH_2)_2$], ізапрапіл — астатак ізапрапану — [$(CH_3)_2CH$].

**АЛКІЛА́Т**, сумесь ізапарафінавых высокаактанавых вуглевадародаў (у асн. $C_6$—$C_9$). Вадкасць, $t_{кіп}$ 40—180 °С, шчыльн. (0,69—0,71)·$10^3$кг/м$^3$. Асн. кампанент — ізаактан (60%). Выкарыстоўваецца як кампанент высокаактанавага паліва для павышэння дэтанацыйнай стойкасці бензіну.

**АЛКІЛІ́РАВАННЕ**, хімічная рэакцыя ўвядзення *алкілу* ў малекулу арган. або неарган. злучэння. Ажыццяўляецца з дапамогай каталізатараў, таксама пры высокім ціску і т-ры. Алкіліруючыя рэагенты: *галагенавытворныя вуглевадародаў, алкены, эфіры* неарган. кіслот, *дыазазлучэнні*. Дае магчымасць сінтэзаваць больш складаныя злучэнні з пажаданымі ўласцівасцямі. Выкарыстоўваецца для вытв-сці высокаактанавага паліва, паверхнева-актыўных рэчываў, антыаксідантаў, фарбавальнікаў, інсектыцыдаў, лекаў.

**АЛКІЛФАСФА́ТЫ**, паверхнева-актыўныя рэчывы аніённай прыроды, $ROPO(OM)_2$ і $(RO)_2POOM$, дзе R — *алкіл*, M — метал, амоній. Пастападобныя рэчывы крэмавага колеру, растваральныя ў вадзе, маюць высокую мыйную ўласцівасць, устойлівыя пры t да 220 °С, біяраскладальныя да 90%. Атрымліваюць узаемадзеяннем вышэйшых спіртоў ці монаалкілпаліэтыленгліколяў з пентаксідам або трыхлораксідам фосфару і наступнай нейтралізацыяй прадуктаў шчолачамі ці аміякам. Выкарыстоўваюцца [пераважна А., у якіх $R=C_nH_{2n+1}$; $C_nH_{2n+1}(OC_2H_4)_m$ (n=6-20; m=4 і 6), M — калій, натрый, амоній] як эмульгатары, кампаненты мыйных і ачышчальных сродкаў, тэкстыльна-дапаможных рэчываў (антыстатыкаў, замаслівальнікаў і інш.).

**АЛКІ́НЫ**, ненасычаныя ацыклічныя вуглевадароды з трайной сувяззю ў малекуле C≡C. Найпрасцейшы з іх *ацэтылен*. Гл. таксама *Ненасычаныя злучэнні*.

**А́ЛКІО** (Alkio; сапр. Філандэр; Filander) Сантэры (17.6.1862, мяст. Лайхія — 24.7.1930), фінскі грамадскі дзеяч, пісьменнік. Пачынальнік сельскага асв. маладзёжнага руху (1888). Адзін з заснавальнікаў партыі Аграрны саюз (1906). У 1919—20 міністр сац. спраў. Дэп. сейма ў 1907—22. Аўтар раманаў і апавяданняў пра сялянскі побыт паўн. Фінляндыі.

**А́ЛКУІН** (Alcuin), Флак Альбін (Flaccus Albinus; каля 735, Йорк, графства Йоркшыр, Брытанія — 19.5.804), англа-саксонскі вучоны. З 782 пры двары Карла Вялікага, яго настаўнік і дарадчык, стварыў навук. і культ. цэнтр *«Каралінгскага адраджэння»*. З 796 абат Турскага манастыра, у якім арганізаваў

школу. Аўтар трактатаў па філасофіі, тэалогіі, псіхалогіі, падручнікаў.

**АЛМА́З** (цюрк. алмас ад грэч. adamas несакрушальны), д ы я м е н т, мінерал, крышт. кубічная мадыфікацыя самароднага чыстага вугляроду. Бясколерны, белы, блакітны, зеленаваты, жаўтаваты, чырванаваты, шэры ці чорны. Бляск алмазны, тлусты. Празрысты; моцная дысперсія святла. Цв. 10 (найцвярдзейшы з вядомых мінералаў). Шчыльн. 3,5—3,53 г/см$^3$. Каштоўны камень 1-га класа.

Трапляецца ў ультраасноўных вывергнутых пародах — кімберлітах, здабываецца з карэнных радовішчаў і россыпаў, звычайна ў выглядзе дробных зярнят і асколкаў крышталікаў (сярэдняя маса 0,2 карата — 40 мг). Вельмі рэдкія А., маса якіх перавышае 50 каратаў (10 г). Самыя вял. ў свеце: «Кулінан» (3106 каратаў, Паўд. Афрыка, Трансвааль, 1905), «Эксцэльсіёр» (971,5 карата, Паўд. Афрыка, ПАР, 1983), «Зорка Сьера-Леоне» (968,9 карата, Зах. Афрыка, Сьера-Леоне, 1972), «Прэзідэнт Варгас» (726,6 карата, Бразілія, 1938), «Джонкер» (726 каратаў, Паўд. Афрыка, Трансвааль, 1934) і інш. Празрыстыя і бясколерныя крышталі самых вял. памераў выкарыстоўваюцца ў ювелірнай справе (пасля агранкі наз. *брыльянтамі*), дробныя, зярністыя, афарбаваныя або з дэфектамі (борт, карбанада) — у тэхн. мэтах (для бурэння свідравін у цвёрдых пародах, шліфавання ў металаапрацоўцы, у электронай прам-сці, рэзкі шкла і інш.). Радовішчы А. у Аўстраліі, Рас. Федэрацыі — Рэспубліка Саха (Якуція), у Паўд. Афрыцы, Паўд. Амерыцы, Індыі. Пошукі А. вядуцца на Беларусі (гл. *Алмазная прамысловасць*).

**АЛМА́ЗНАЯ ПРАМЫСЛО́ВАСЦЬ**, галіна горнай прам-сці па здабычы і апрацоўцы *алмазаў*, а таксама вытв-сці сінт. алмазаў.

Апрацоўка алмазаў існуе са старажытнасці. Алмазы былі вядомы ў Індыі з 8—7 ст. да н.э. У пач. 18 ст. яны знойдзены ў Бразіліі, у 1829 — у Расіі (на Урале), у 1866 — у Паўд. Афрыцы. З канца 19 — пач. 20 ст. Афрыка стала асн. алмазаздабыўным рэгіёнам свету. З 1955 пачалася прамысл. здабыча алмазаў у Якуціі. Агульныя запасы алмазнай сыравіны ацэньваюцца больш як у 2 млрд. каратаў (1 кар — 200 мг), найб. ў Заіры, ПАР, Батсване, Анголе, Гане, Намібіі, Аўстраліі.

Па здабычы ювелірных алмазаў 1-е месца ў свеце займае Афрыка, каля паловы сыравіны тэхн. алмазаў здабываецца ў Аўстраліі. Асн. вытворцы ювелірных алмазаў — Паўд. Афрыка, Батсвана, Расія, Намібія і Ангола. Каля 80% сусв. здабычы алмазаў кантралюе найбуйнейшая ў галіне кампанія «Дэ Бірс кансалідэйтэд майнс». Збыт прыродных алмазаў на сусв. рынку ажыццяўляе манапаліст — *Алмазны сіндыкат*. Каля 100% ювелірнай сыравіны, якая паступае на рынак, перапрацоўваецца ў *брыльянты*. Ювелірныя алмазы апрацоўваюцца пераважна ў Амстэрдаме, Тэль-Авіве, Бамбеі, Нью-Йорку. Сінтэтычныя алмазы (памеры 0,01—1,2 мм) вырабляюць Расія і некат. краіны Усх. Еўропы, амер. кампанія «Джэнерал электрык», прадпрыемствы кампаніі «Дэ Бірс», у ПАР, Ірландыі і Швецыі, а таксама японскія, герм. і інш. фірмы. Сучасная штогадовая вытв-сць сінт. алмазаў ацэньваецца ў 150 млн. кар; за іх кошт на 75% забяспечваецца выраб алмазнага інструменту. На Беларусі арг-цыямі ВА «Беларусьгеалогія» вядзецца пошук алмазаў. У 1980—90 выяўлены алмазаносныя кімберліт-лампраітавыя пароды на ПдУ рэспублікі. Знойдзены 3 крышталі алмазаў. На прывазной сыравіне наладжана апрацоўка алмазаў у Гомелі (прадпрыемства «Крышталь»).

**АЛМА́ЗНЫ ІНСТРУМЕ́НТ**, інструмент, рэжучая частка якога складаецца з часцінак прыродных ці сінт. *алмазаў*. Адрозніваюць А.і. абразіўны, зроблены з алмазных парашкоў на арган. ці метал. звязках (шліфавальныя кругі, хоны, брускі, пілкі), і з алмазных крышталёў (разцы, свердлы, шкларэзы, гравіравальныя іголкі, наканечнікі для цвердамераў, каронкі, долаты, расшыральнікі, брускі, правільныя алоўкі і ролікі). Выкарыстоўваецца для апрацоўкі цвёрдых сплаваў, металаў, шкла, кварцу, жалезабетону, для бурэння свідравін і праўкі шліфавальных кругоў. Забяспечвае высокую якасць апрацоўкі.

**АЛМА́ЗНЫ СІНДЫКА́Т**, міжнародная манаполія па збыце прыродных і сінтэтычных алмазаў. Засн. ў 1892, аб'ядноўвае ПАР, Заір, Танзанію, Намібію і інш. Кантралюе 60—65% збыту алмазаў. Вядучая роля ў А.с. належыць кампаніі «Дэ Бірс кансалідэйтэд майнс».

**АЛМА́ЗНЫЯ ГО́РЫ**, гл. *Кымгансан*.

**АЛМАЛЫ́К**, горад ва Узбекістане, у Ташкенцкай вобл., на схілах Курамінскага хрыбта, за 18 км ад чыг. ст. Ахангаран. 116 тыс. ж. (1990). Цэнтр каляровай металургіі (горна-металургічны камбінат). Хім., харч. прам-сць; вытв-сць буд. матэрыялаў. ЦЭЦ.

**АЛМАСЗАДЭ́** Гамэр Гаджы Ага кызы (н. 10.3.1915, Баку), азербайджанская артыстка балета, балетмайстар. Нар. арт. СССР (1959). Пачала выступаць у 1930, была першай азерб. балерынай. Скончыла Ленінградскае харэагр. вучылішча (1936). Салістка, з 1953 гал. балетмайстар Азерб. т-ра оперы і балета. Сярод партый: Гюльянак («Дзявочая вежа» А.Бадалбейлі), Гюльшэн («Гюльшэн» С.Гаджыбекава, Дзярж. прэмія СССР 1952), Айша («Сем прыгажунь» К.Караева). Паст.: «Гюльшэн» (1950), «Чырвоная кветка» Р.Гліэра (1954), «Шур» Ф.Аміравa (1968) і інш.



Алмаз «Гарняк» (44,62 кар).

Да арт. **Алмаз**. Малая расійская імператарская карона. Серабро. Брыльянты. С.-Пецярбург. 1801.

**Алмазны інструмент**: 1 — адразная піла; 2 — буравая каронка; 3 — правільны ролік прамога профілю; 4 — правільны ролік фасонны; 5 — правільны аловак; 6 — правільны ролік фасонны многаручаёвы.

**АЛМАТЫ́**, Алма-Ата, горад, сталіца *Казахстана* (да 1995). Размешчаны на ПнУ рэспублікі, каля падножжа паўн. схілаў хр. Заілійскі Алатау, на выш. 650—950 м, паміж рэкамі В. і М. Алмаацінкі. 1200 тыс. ж. (1993). Чыг. станцыя, вузел аўтадарог (аўтамагістралі на Бішкек, Сяміпалацінск і да мяжы з Кітаем). Аэрапорт. Буйны індустр. і культ. цэнтр рэспублікі. Машынабудаванне і металаапрацоўка (цяжкае машынабудаванне, электратэхн., станкабудаванне і інш.), харчасмакавая (кансервавая, тытунёвая і інш.), лёгкая (тэкст., футравая, трыкат., абутковая) прам-сць; выт-сць буд. матэрыялаў. ЦЭС, каскад ГЭС на В.Алмаацінцы. А. неаднойчы цярпеў ад землетрасенняў і селяў (зроблены супрацьселевыя збудаванні).

Засн. ў 1854 як рас. ваен. ўмацаванне Вернае на месцы казахскага паселішча Алматы. З 1867 г. Верны — цэнтр Сямірэчанскай вобл. Туркестанскага ген.-губернатарства. Быў месцам паліт. ссылкі. У 1921 перайменаваны ў Алма-Ату, у 1929—95 сталіца Казахстана (перанесена ў г. Акмала). Развіццю горада садзейнічала Туркестана-Сібірская чыг., пабудаваная ў 1930. З 1992 наз. Алматы.

Горад захаваў прамавугольную планіроўку. Яго сучасны выгляд вызначае ансамблевая сейсмаўстойлівая забудова, шырокія азеленены праспекты і вуліцы. Сярод арх. збудаванняў: т-р оперы і балета (1941, арх. М.Прастакоў), Дом урада (1958, арх. Б.Рубаненка, Г.Сіманаў і інш.), цырк (1972, арх. У.Кацаў, І.Слонаў), высакагорны спарткомплекс «Медэа» (1972, 1975, арх. Кацаў і інш.), музей мастацтваў Казахстана (1976, арх. Э.Кузняцова, В.Навумава, Б.Новікаў), аэравакзал (1976, арх. І.Шчавелева, А.Лепік і інш.), гасцініца «Казахстан» (1977, арх. Л.Ухобатаў, Ю.Ратушны), т-р драмы (1980, арх. А.Бармурзаеў, М.Жаксылыкаў і інш.). Помнікі: Абаю (1960, скульпт. Х.Наурзбаеў), Аўэзаву (1980, скульпт. Я.Сергебаеў) і інш.

Дзейнічаюць (1989): Акадэмія навук, 15 ВНУ (у т.л. Каз. ун-т, кансерваторыя), 7 тэатраў (оперы і балета імя Абая, т-р драмы імя Аўэзава, лялек і інш.), 7 музеяў (гістарычны, мастацтваў Казахстана, Дом-музей М.Аўэзава і інш.).

*Літ.:* Алма-Ата: Энцикл. Алма-Ата, 1983.

*Р.А.Жмойдзяк* (гаспадарка).

**АЛМЕ́ЙДА** (Almeida) Франсішку (каля 1450, Лісабон — 1.3.1510), партугальскі мараход; 1-ы віцэ-кароль Індыі (1505—09). Заваяваў тэр. ў Зах. Індыі, стварыў апорныя пункты на ўзбярэжжы Індыйскага ак., у Афрыцы і Паўд.-Зах. Азіі. Пабудаваў форты ў Кануры і на в-ве Анджыдыў. У 1509 каля в-ва Дыу разбіў флот егіп. султана, пасланы для выгнання партугальцаў з Індыйскага ак. Забіты афрыканцамі ў час вяртання на радзіму.

**АЛМЕ́ЙДА-ГА́РЭТ** (Almeida Garrett) Жуан Баптышта да Сілва Лейтан ды (da Silva Leitão; 4.2.1799, г. Порту, Партугалія — 9.12.1854), партугальскі пісьменнік. Прыхільнік дэмакр. канстытуцыі, у 1823 вымушаны эмігрыраваць. Пазней — дыпламат і дэпутат парламента. Заснавальнік прагрэс.-раманц. кірунку ў партуг. л-ры (паэмы «Камоэнс», 1825, «Дона Бранка», 1826; зб-кі лірычных вершаў «Кветкі без плады», 1845; «Апалае лісце», 1853). У цэнтры рамана «Арка святой Ганны» (ч. 1—2, 1845—51) і драм «Аўту Жыла Вісентэ» (1838), «Збройнік з Сантарэма» (1841), «Брат Луіж ды Сауза» (1844) — эпізоды нац. гісторыі.

*Тв.:* Рус. пер. — Арка святой Анны. М., 1985.

**АЛО́Д** (ням. Allod), свабодна адчужальная індывід.-сямейная зямельная ўласнасць у раннефеад. дзяржавах Зах. Еўропы. Прыйшоў на змену абшчынным формам уласнасці. З развіццём феад. адносін большасць дробных А. ператварылася ў залежныя сял. дзяржанні, а буйныя і сярэднія — у *бенефіцыі* і *феоды*. Як перажытак А. існаваў і пры развітым феадалізме. На Беларусі А. ў некаторай ступені адпавядала *вотчына*.

**АЛО́НАЎ** Яўген Піліпавіч (1875, Гарадоцкі р-н Віцебскай вобл. — 23.12.1929), ветэрынарны ўрач, заснавальнік навук. ветэрынарыі на Беларусі. Герой працы (1924). Скончыў Варшаўскі вет. ін-т (1903). У 1913 арганізаваў першую на Беларусі вет. лабараторыю ў Віцебску, у 1914 — экспедыцыйнае абследаванне жывёлагадоўлі Віцебскай губ. Заснавальнік і з 1924 рэктар Віцебскага вет. ін-та, адначасова кіраўнік Вет. ўпраўлення Наркамата земляробства БССР. Навук. працы па аналізе вет.-сан. стану і прычынах хвароб с.-г. жывёлы на Беларусі. Ініцыятар распрацоўкі «Ветэрынарнага статута БССР», заснавання віцебскіх вет.-заалагічнага музея (1918), бат. сада, музея анатоміі, арніталогіі і энтамалогіі (1924).

*Тв.:* Витебская губерния в ветеринарно-санитарном отношении (1903—1910). Витебск, 1912.

*Літ.:* Вышелесский С. Е.Ф.Алонов // Бел. ветэрынарыя. 1929. № 10—12; Сипко Н.Г. Ветеринарное образование в Белоруссии // Ветеринария. 1967. № 6.



Да арт. **Алматы**. Будынак цырка.

**АЛО́НСА** (Alonso; сапр. Мартынес дэль Ойо) Алісія (н. 21.12.1921, Гавана), кубінская артыстка балета, балетмайстар; заснавальніца кубінскага балета. Стварыла з Фернанда і Альберта А. ў Гаване трупу «Балет Алісіі А.» (1948, з 1959 — нац. балет Кубы). Паставіла шэраг арыгінальных балетаў. Сярод партый: Жызэль («Жызэль» А.Адана), Адэта — Адылія («Лебядзінае возера» П.Чайкоўскага), Сванільда («Капелія» Л.Дэліба), Тэрпсіхора («Апалон Мусагет» І.Стравінскага).

**АЛО́ЎНІКАЎ** Ігар Уладзіміравіч (н. 5.11.1954, Мінск), бел. піяніст, арганіст,

**Алматы**.

педагог. Засл. арт. Беларусі (1986). Праф. (1994). Сын У.У.*Алоўнікава*. Скончыў Маскоўскую кансерваторыю па класах фп. і аргана (1978). З 1980 саліст Бел. філармоніі, адначасова выкладае ў Бел. акадэміі музыкі (у 1987—92 заг. кафедры). Творчасць А. спалучае высокі прафесіяналізм, віртуознае майстэрства, тонкае пачуццё стылю, арты-

У.У.Алоўнікаў.

стызм. У рэпертуары фп. творы І.С.Баха, Л.Бетховена, Ф.Шапэна, В.А.Моцарта, С.Рахманінава, бел. кампазітараў Г.Вагнера, Л.Абеліёвіча, С.Картэса і інш. Аўтар шматлікіх транскрыпцый твораў муз. класікі і бел. кампазітараў для фп. і аргана. Складальнік і рэдактар зборнікаў бел. фп. музыкі «Віртуоз», «Піяніст», «Сувенір». Дзярж. прэмія Беларусі 1994.

*І.І.Зубрыч.*

**АЛО́ЎНІКАЎ** Уладзімір Уладзіміравіч (н. 16.1.1919, Бабруйск), бел. кампазітар. Нар. арт. Беларусі (1970). Праф. (1980). Бацька І.У.*Алоўнікава*. Скончыў Бел. кансерваторыю (1941, класы кампазіцыі В.Залатарова і фп. М.*Бергера*), у 1947—94 педагог у ёй, у 1962—82 рэктар. Аўтар сімфанічнай, камерна-інстр. і вак. музыкі. Жыццесцвярджальнасцю і лірычнай пранікнёнасцю вызначаюцца шырока вядомыя яго песні: «Радзіма мая дарагая», «Ляская песня», «Песня пра Брэсцкую крэпасць», «Песня пра К.Заслонава», «Песня аб Мінску», «Недзе ў пасёлку» і інш. Найб. значныя праграмныя сімф. творы: паэмы «Партызанская быль» (1952), «Нарач» (1954), сюіта «Песні міру» (1958); араторыя «Партызанскія песні» (1994).

*Інш. тв.:* кантата для дзяцей «Усім піянерам таварыш і брат» (памяці М.Казея), «Урачыстая прэлюдыя» і эскіз «Куранты Брэсцкай крэпасці» для сімф. арк.; сюіта «На Палессі» і муз. карцінка «Зорка Венера» для арк. бел. нар. інструментаў; п'есы для фп., скрыпкі і фп.; хары, рамансы, музыка да драм. спектакляў і кінафільмаў.

*Літ.:* З у б р ы ч І.І. Уладзімір Алоўнікаў. Мн., 1970. *І.І.Зубрыч.*

**АЛО́Э** (Aloe), род кветкавых раслін сям. асфадэлавых. Каля 350 відаў. Растуць у пустынных і засушлівых раёнах Афрыкі, на Пд Аравійскага п-ва і Міжземнамор'я (1 від). Многія з іх лек., харч., меданосныя, тэхн. (валакністыя) і дэкар. расліны; вырошчваюць у пакоях, аранжарэях і цяпліцах. На Беларусі ў пакаёвай культуры найб. вядомы: А. дрэвападобнае (A. arborescens), альяс, цвіце вельмі рэдка і таму наз. сталетнікам; А. мыльнае (A. saponaria), А. паласатае (A. striata), А. стракатае (A. variegata), А. асцюковае (A. aristata).

Шматгадовыя травяністыя, кустападобныя і дрэвападобныя сукуленты з простым кароткім або развітым, тоўстым разгалінаваным або тонкім ліянападобным сцяблом, часцей зусім без яго (разеткападобныя формы). Лісце мясістае, часта з васковым налётам, плямамі і палосамі, па краях з зубцамі, у густых прыкаранёвых ці канцавых (у дрэвавых формаў) разетках або двухраднае. Кветкі чырвоныя, аранжавыя, жоўтыя, зялёныя, рэдка крэмавыя і белыя, у суквеццях. Плод сухая каробачка. З лісця некаторых відаў вырабляюць сабур (слабіцельны сродак), экстракты, сокі, сіропы, тэрапеўтычныя сродкі. Прэпаратамі А. карыстаюцца ў тканкавай тэрапіі (біястымулятары). У нар. мёдыцыне свежае лісце ўжываюць пры бранхіяльнай астме, язве страўніка і кішэчніка, туберкулёзе, ранах, нарывах.

Алоэ дрэвападобнае.

**АЛПА́ТАЎ** Міхаіл Уладзіміравіч (10.12.1902, Масква — 9.5.1986), рускі гісторык мастацтва. Засл. дз. маст. РСФСР (1958); правадз. чл. АМ СССР (1954). Д-р мастацтвазнаўства (1941). Скончыў Маскоўскі ун-т (1921). З 1925 выкладаў у ВНУ Масквы. З 1943 праф. Маскоўскага маст. ін-та. Асн. працы А. па праблемах гісторыі рус. і замежнага мастацтва. Дзярж. прэмія СССР 1974.

*Тв.:* Всеобщая история искусств. Т. 1—3. М.; Л., 1948—55; Этюды по истории русского искусства. Т. 1—2. М., 1967; Андрей Рублёв: [Альбом]. М., 1972; Художественные проблемы итальянского Возрождения. М., 1976.

Алтаіт.

**АЛТАІ́Т** (назва ад першай знаходкі на Алтаі), мінерал класа тэлурыдаў. Мае Pb 60,2—61,3% і Te 36,8—38,4% з інш. прымесямі. Часта ў цесных зрашчэннях з самародным золатам, серабром, галенітам. Крышталізуецца ў кубічнай сінганіі. Звычайна трапляецца ў выглядзе дробных украпаных зярнят (у галеніце); зрэдку ўтварае крышталі, зярністыя агрэгаты. Колер алавяна-белы. Бляск металічны. Цв. 2,5—3. Шчыльн. 8,2—8,3 г/см$^3$. Гідратэрмальны мінерал; сустракаецца ў невял. колькасцях у рудах свінцова-цынкавых і золата-сярэбраных радовішчаў.

**АЛТА́Й** (ад цюркска-манг. алтан залаты), горная сістэма ў Азіі на тэр. Расійскай Федэрацыі, Казахстана, Манголіі і Кітая. Працягласць больш за 2000 км, макс. шырыня больш за 500 км. Распасціраецца з ПнЗ ад Зах.-Сібірскай раўніны на ПдУ да раўнін Гобі. Складаецца з сістэмы расчлянёных хрыбтоў, нагор'яў, пласкагор'яў, міжгорных упадзін, катлавін. Водападзел Обі, Енісея, рэк бяссцёкавага бас. Цэнтр. Азіі. Найб. вяршыня — г. Бялуха (4506 м). Падзяляецца на ўласна Алтай (Расійскі, Казахстанскі), Мангольскі А. і Габійскі А. Тэктанічныя структуры А. належаць да герцынскай і каледонскай складкавасцяў. Складзены з пратэразойскіх і пераважна палеазойскіх парод: метамарфічных сланцаў, слюдзістых кварцытаў, амфібалітаў, вапнякоў, алеўралітаў, гліністых сланцаў, вулканагенных парод і інш. Асадкавыя, вулканічныя і метамарфічныя пароды пранізаны гранітнымі і гранадыярытавымі інтрузіямі. Сучасны выгляд А. набыў у выніку падняцця у неагенавы і чацвярцічны перыяды. Грабяні высакагорных хрыбтоў характарызуюцца альпійскімі формамі рэльефу. Ёсць буйныя міжгорныя катлавіны, т.зв. стэпы (Чуйскі, Курайскі, Уймонскі, Абайскі, Канскі і інш.). У нізкагор'ях і сярэднягор'ях развіты паверхневыя і падземныя карставыя формы. Карысныя выкапні: поліметалічныя руды, золата, ртуць, сурма, вальфрам, марганец, жалеза, буры вугаль, солі, сульфаты і інш. Багатыя радовішчы мармуру і каштоўных вырабных камянёў (яшмы, парфіры і інш.). Тэрмальныя крыніцы: Абаканская, Белакурыхінскія, Рахманаўскія, Джумалінскія.

Клімат А. кантынентальны. Зіма халодная і працяглая. Сярэдняя т-ра студз. ад -15 °С (у перадгор'ях) да -28...-32 °С у міжгорных катлавінах у выніку тэмпературных інверсій. Лета адносна кароткае і халаднаватае; у перадгор'ях сярэдняя т-ра ліп. 19—22 °С, на высакагор'ях 14—16 °С. На схілах зах. раёнаў ападкаў да 2000 мм, паўн.-ўсх. — да 1000 мм, на ПдУ да 200 мм за год. Характэрны горна-

далінныя вятры (фёны). Магутнасць снегавога покрыва ў Зах. А. можа дасягаць 2—3 м. Каля 1500 ледавікоў агульнай пл. больш за 900 км². Развіта густая сетка горных рэк, найбольшыя: Катунь, Бухтарма, Бія, Чуя. Жыўленне рэк пераважна алтайскага тыпу — талымі снегавымі водамі і летнімі дажджамі. Больш як 3500 азёраў, пераважна каравых і марэнападпрудных, самыя вял. Маркаколь і Цялецкае маюць катлавінны тэктанічнага паходжання.

На А. добра выражана сістэма вышынных ландшафтных паясоў. У паўн. і зах. перадгор'ях да выш. 400—700 м — лугавыя разнатраўна-злакавыя, да выш. 1200—1500 м — палыновацітчаковыя стэпы. Горныя лясы займаюць каля $^2/_3$ тэрыторыі. Сярод іх пераважаюць паркавыя лістоўнічныя (да выш. 2000—2200 м). На Пн лясы цемнахвойныя, у т.л. кедравыя. Характэрны высакатраўныя лугі (велікатраўе), а таксама астравы горных стэпаў. На выш. 1400—2000 м у засушлівых катлавінах пашыраны паўпустынныя ландшафты. Высакагорная зона (выш. 1800—2400 м) з субальпійскімі хмызнякамі і лугамі змяняецца нізкатраўнымі альпійскімі лугамі. Ва ўсх. і паўн.-ўсх. раёнах пашыраны горныя тундры (хмызняковыя, імхова-лішайнікавыя, камяніста-друзавыя). Вышэй альпійскіх лугоў і тундраў — голыя скалы, камяністыя россыпы, снежныя палі і ледавікі. Жывёльны свет разнастайны, стэпавага (суслікі, хамякі, палёўкі і інш.), таежнага (мядзведзь, рысь, ліс, собаль, вавёрка, марал, глушэц і інш.), высакагорнага (алтайская пішчуха, горны казёл, снежны барс і інш.) комплексаў. На тэр. А. — Алтайскі запаведнік.

*Літ.:* Гвоздецкий Н.А., Голубчиков Ю.Н. Горы. М., 1987. *А.М.Баско.*

**АЛТА́Й**, Рэспубліка Алтай, у складзе Расійскай Федэрацыі. Пл. 92,6 тыс. км². Нас. 192 тыс. чал. (1993): алтайцы, рускія, казахі і інш.; гар. насельніцтва 30%. Сталіца — г. *Горна-Алтайск.*

**Прырода.** Тэр. размешчана ў высакагорнай паўн. ч. Алтая (выш. да 4506 м, г. Бялуха). Горныя хрыбты (Катунскі, Курайскі, Паўн. і Паўд. Чуйскія) падзелены глыбокa ўрэзанымі далінамі і шырокімі катлавінамі, т. зв. стэпамі (Абайскі, Уймонскі, Чуйскі і інш.). Клімат рэзка кантынентальны. Сярэдняя т-ры студз. ад -12 да -32 °С, ліп. 9—18 °С. Ападкаў ад 100 мм (у катлавінах) да 1000 мм (на ПнЗ) за год. Буйныя рэкі Катунь і Бія; воз. Цялецкае. Значныя запасы электраэнергіі. Лесасплаў па р. Бія. Глебы пераважна горна-падзолістыя, у паўн.-зах. ч. на ніжніх схілах гор і ў далінах чарназёмныя. 25% тэр. займаюць горна-таежныя лясы з пераважаннем хвойных парод (сібірская лістоўніца, кедр, піхта), на выш. больш за 2000—2500 м субальпійскія і альпійскія лугі. Алтайскі запаведнік.

**Гісторыя.** На тэр. А. выяўлены стаянкі чалавека эпохі палеаліту (Улалінка, У-Кан). Праз А. праходзілі гуны, цюркскія плямёны, уйгуры, енісейскія кыргызы, каракітаі, манголы. З пач. 13 ст. ўваходзіў у манг. імперыю Чынгісхана, потым у склад розных феад. аб'яднанняў. Шчыльнасць насельніцтва была невялікая. Яно займалася качавой жывёлагадоўляй, паляваннем, арэхавым промыслам; панавалі патрыярхальна-феад. адносіны. З каланізацыяй Сібіры Расіяй плямёны алтайскіх жывёлаводаў пачалі прымаць рус. падданства. Гэты працэс узмацніўся ў час спусташальнай вайны 1755 паміж Маньчжурскімі правіцелямі Кітая і *Айрацкім ханствам* (Джунгарыяй), у склад якога ўваходзіў А. Ратуючыся ад знішчэння, у 1756 алтайцы прынялі падданства Расіі. У студз. — сак. 1918 тут абвешчана сав. ўлада. У чэрв. 1918 А. заняты белагвардзейцамі, са жн. 1919 пачаўся партыз. рух супраць войскаў Калчака. У кастр. 1919 партызаны аб'ядналіся ў дывізію (больш за 18 тыс. чал.) з балышавіцкім штабам (камандзір І.Я.Трацціяк). У крас. 1920 устаноўлена сав. ўлада. 1.6.1922 у складзе РСФСР утворана Айроцкая аўт. вобл., перайменаваная ў 1948 у Горна-Алтайскую аўт. вобл., а яе цэнтр Айрот-Тура — у Горна-Алтайск. У 1993 А. абвешчаны Рэспублікай у складзе Рас. Федэрацыі.

**Гаспадарка.** Асн. галіны прам-сці: лясная, дрэваапр., лёгкая (тэкст., гарбарная, абутковая), харч. (мясная, масларобная і інш.), вытв-сць буд. ма-

Да арт. **Алтай.** Горны Алтай.

тэрыялаў, электраэнергетыка (будуюцца Чэмальская і Катунская ГЭС на р. Катунь). Асн. галіны сельскай гаспадаркі — мяса-малочная жывёлагадоўля, авечкагадоўля, козагадоўля; гадуюць якаў, маралаў і плямістых аленяў. Пасевы кармавых і збожжавых культур у горных катлавінах і далінах буйных рэк

(авёс, ячмень і інш.). Развіта пладаводства. Пчалярства. Пушны промысел. Асн. транспартная магістраль — Чуйскі тракт. Аэрапорт. Горнакліматычны і кумысалячэбны курорт Чэмал. Турызм (воз. Цялецкае, горна-лыжная траса даўж. 1500 м).

**АЛТА́Й ГАБІ́ЙСКІ**, гл. *Габійскі Алтай.*

**АЛТА́Й МАНГО́ЛЬСКІ**, гл. *Мангольскі Алтай.*

**АЛТА́ЙСКІ КРАЙ**, у складзе Расійскай Федэрацыі. Утвораны 28.9.1937. Размешчаны на ПдЗ Зах. Сібіры. Пл. 158,4 тыс. км². Нас. 2687 тыс. чал. (1994); большая ч. рускія, украінцы, жывуць казахі, беларусы, алтайцы і інш.; гар. насельніцтва 52%. Цэнтр — г. *Барнаул.* Найбольшыя гарады: Барнаул, Бійск, Рубцоўск, Новаалтайск, Зарынск, Слаўгарад.

Бакавы **алтар** «Ганна і Марыя з дзіцем» у Спаса-Праабражэнскай царкве ў в. Порплішча Докшыцкага раёна Віцебскай вобл. 17 ст.

**Прырода**. А.к. займае паўд. ч. Зах.-Сібірскай раўніны (у т.л. Кулундзінскую раўніну і Прыобскае плато). На ПнУ тэр. акаймавана Салаірскім кражам, на ПдУ — паўн. адгор'ямі Алтая (выш. 2007 м, г. Чорная). Карысныя выкапні: поліметалічная і жал. руды, вапнякі, гліны, мірабіліт, кухонная соль, сода. Клімат рэзка кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. -19 °С, ліп. 19 °С. Ападкаў 250—350 мм за год. Гал. рака Об. Вял. азёры: Кулундзінскае, Кучукскае, Міхайлаўскае. Пераважаюць чарназёмныя, на З саланцавата-саланчаковыя глебы. У перадгор'ях лясы з лістоўніцы, сібірскай піхты, кедравай хвоі і інш.

**Гаспадарка**. Асн. галіны прам-сці — машынабудаванне і металаапрацоўка (трактары і с.-г. машыны, вагоны, рухавікі, кавальска-прэсавае і горназдабыўное абсталяванне, радыёапаратура і інш.), хім. і нафтахім. (вытв-сць шын, штучнага валакна, хім. вырабаў). Развіты харч. (мясная, сыраробная, масларобная), лёгкая (вытв-сць баваўняных тканін, трыкатажу), горназдабыўная (поліметалічныя і жал. руды, кухонная і глаўберава соль), дрэваапр. прам-сць. У сельскай гаспадарцы пераважае земляробства: пасевы збожжавых (пшаніца, кукуруза, авёс, проса, грэчка), цукр. буракоў, сланечніку, ільну, кармавых культур. Вырошчваюць бульбу, агародніну. Пладаводства. Малочна-мясная жывёлагадоўля, свінагадоўля, мяса-воўнавая коза- і авечкагадоўля. Птушкагадоўля. Пчалярства. Гал. транспарт чыг. і аўтамабільны. Асн. чыг. магістралі: Новасібірск — Барнаул — Рубцоўск — Сяміпалацінск з адгалінаваннем на Бійск; Артышта—Барнаул—Кулунда—Паўладар; Татарск—Кулунда—Малінавае Возера; Алтайскае—Камень-на-Обі—Карасук. Аўтамаб. дарогі: Чуйскі тракт (ад Бійска праз Алтай у Манголію), Новасібірск — Барнаул. Суднаходства па Обі. Курорты Белакурыха, Лябяжае. *Р.А.Жмойдзяк.*

**«АЛТА́ЙСКІ ТРА́КТАР»**, адзін з буйнейшых трактарных з-даў Расійскай Федэрацыі. Пабудаваны ў 1942—43 у г. Рубцоўск (Алтайскі край) на базе эвакуіраванага Харкаўскага трактарнага з-да як Алтайскі трактарны з-д. Выпускае гусенічныя трактары, спецыялізуецца на трактарах с.-г. агульнага прызначэння, цяглавых 3—5-га класаў (магутнасцю 110—170 к.с.), лесапрамысловых (тралёвачных), малагабарытных і агрэгатах, дэталях, вузлах да трактароў. Сярод перспектыўнай прадукцыі — трактар Т-250 з рухавіком 250 к.с. і садоваагародны малагабарытны МТ-10.

*С.А.Казак-Антаневіч.*

**АЛТА́ЙСКІЯ МО́ВЫ**, макрасям'я моў, што аб'ядноўвае цюркскія, мангольскія, тунгуса-маньчжурскія, а таксама ізаляваныя карэйскую і японскую мовы (гл. адпаведныя арт.). Збліжаюцца агульнасцю рысаў: фанетычных (заканамернасць палатальнага і лабіяльнага сінгарманізму зычных і галосных, асіміляцыі зычных; корань 1-складовы, 3-гукавы, найчасцей утварае закрыты склад), марфалагічных (словаўтварэнне і словазмяненне з дапамогай аглюцінатыўных афіксаў, адсутнасць роду, наяўнасць катэгорыі прыналежнасці) і сінтаксічных (паясняльныя словы ў сказе абавязкова стаяць перад пераснёнымі, слабае развіццё складаназалежных сказаў). Найб. сувязь А.м. у лексіцы, што тлумачыцца іх генетычнай блізкасцю.

*Літ.:* Баскаков Н.А. Алтайская семья языков и её изучение. М., 1981.

**АЛТА́ЙЦЫ** (у 1922—48 наз. таксама айротамі), народ у Рэспубліцы Алтай. 60 тыс. чал. (1979). Падзяляюцца на этнагр. групы: алтай-кіжы, тэленгіты, тэлесы, тэлеуты, тубалары, чалканцы, кумандзінцы. Гавораць на алтайскай мове.

**АЛТА́Р** (лац. altaria ад altus высокі), частка хрысціянскага храма, аддзеленая перагародкай або *іканастасам.* У першабытных і стараж. народаў — узвышэнне, якое служыла месцам для прынясення ахвяр. У біблейскай гісторыі — сімвал прымірэння чалавека з Богам. Ант. грэкі і рымляне ставілі А. па-за храмам, аздабляліся скульпт. выявамі (Пергамскі алтар). У першых хрысціянскіх храмах А. меў выгляд стала («прастол»), на якім гатавалі і раздавалі прычасце; часам пад ім рабілі склепы для пахавання пакутнікаў. З 4 ст. такую ж назву атрымала частка храма, дзе знаходзіўся ахвярнік. У раманскай архітэктуры гал. А. каталіцкага храма размяшчаўся каля ўсх. сцяны, меў простую аздобу, у гатычнай (А.-шафка) — упрыгожваўся жывапісам, разьбой, пазалотай, паліхраміяй, у

рэнесансавай — пераважна жывапісам. У эпоху барока ўзніклі ансамблі багата аформленых скульптурна-жывапісных А. у сінтэзе з архітэктурай храма. На Беларусі такія А. захаваліся ў касцёлах у Гродне, Слоніме, Дзятлаве, у вёсках Камаі Пастаўскага, Будслаў Мядзельскага, Новая Мыш Баранавіцкага р-наў, у Спаса-Праабражэнскай царкве ў в. Порплішча Докшыцкага р-на і інш.

*А.А.Ярашэвіч.*

**АЛТЫ́Н** (ад тат. алты шэсць), 1) лікаваграшовая адзінка ў Расіі 14 — пач. 18 ст., роўная 6 *дзенгам*, пазней 3 *капейкам*. Упершыню ў рус. пісьмовых крыніцах упамінаецца каля 1375, у бел. — пад 1532. 2) Рас. сярэбраная манета ў сярэдзіне 17 — пач. 18 ст.

**АЛТЫНКО́ЛЬ**, гл. *Цялецкае возера*.

**АЛТЫНСАРЫ́Н** Ібрай (20.10.1841 — 17.7.1899), казахскі педагог-асветнік, пісьменнік, этнограф. Яго намаганнямі адкрыты шэраг школ з каз. мовай навучання. Распрацаваў сістэму школьнай адукацыі; на аснове рус. графікі склаў праект каз. алфавіта, падручнікі роднай і рус. мовы для дзяцей («Пачатковы дапаможнік па навучанні кіргізаў рускай мове», 1871; «Кіргізская хрэстаматыя», 1879 і інш.). Арыгінальныя і перакладныя маст. творы А., змешчаныя ў падручніках, прасякнуты дэмакр. і гуманіст. ідэямі.

*Ж.Сахіеў.*

**АЛТЫНТА́Г**, горы ў Цэнтр. Азіі, на З Кітая, паміж Куньлунем і Наньшанем. Аддзяляюць Тарымскую ўпадзіну і Цайдамскую катлавіну. Даўж. каля 800 км. Паўд.-зах. частка А. — скалістая, моцна расчлянёная, укрыта вечнымі снягамі і ледавікамі, макс. выш. да 6161 м; паўн.-ўсходняя — кароткія масівы выш. больш за 5000 м; цэнтральная — рэзка звужаная і паніжаная, пераважная выш. да 3000—3500 м. Складзены з гнейсаў, крышталічных сланцаў, філітаў. Карысныя выкапні: руды храмітаў, свінцу, цынку, нікелю, плаціны. Клімат рэзка кантынентальны, засушлівы. Найб. р. Чэрчэн з прытокамі. На перадгор'ях камяністыя пустыні, у далінах растуць эфедры, салянкі, зараснікі саксаулу і тамарыску, на схілах гор — стэпавая раслінная і альпійскія лугі. Жывёльны свет: дзікі як, антылопы, кукуяманы і інш.

**АЛТЭ́Я** (Althaea), род кветкавых раслін сям. мальвавых. Каля 12 відаў. Пашыраны ва ўмеранай зоне Еўропы і Азіі. На Беларусі інтрадукавана А. лекавая (A. officinalis), трапляецца ў культуры і як здзічэлая, А. каноплевая (A. cannabina), вырошчваюць у Цэнтр. бат. садзе АН.

Адна- або шматгадовыя расліны. Найб. вядомая А. лекавая — шматгадовая травяністая расліна з моцным прамастойным сцяблом выш. да 150 см і тоўстымі мясістымі каранямі. Лісты нераўнамерна-зубчастыя, ніжнія амаль круглыя, верхнія яйцападобныя. Кветкі бледна-ружовыя, пазушныя. Лек., дэкар., тэхн., харч., кармавыя, меданосныя і перганосныя расліны. Карані выкарыстоўваюць як адхарквальны, змякчальны і процізапаленчы сродак («алтэйны корань»).

Алтэя лекавая.

Галоўны алтар касцёла ў в. Камаі Пастаўскага раёна Віцебскай вобл. 1-я пал. 18 ст.

**АЛУЛАНО́З**, гельмінтозная хвароба жывёл, узбуджальнікі якой дробныя нематоды (Ollulanus tricuspis, O.skrjabini, O. andarica, O. suis). Шырока распаўсюджана, вывучана недастаткова. Характарызуецца пашкоджаннем страўніка. Нематоды паразітуюць у прасвеце і тоўшчы слізістай абалонкі страўніка, вывадных пратоках яго залоз, радзей у 12-перснай кішцы і інш. месцах. Хварэюць пераважна дарослыя свінні. Хворай жывёліне ўласцівы дрэнны апетыт, ірвота, паносы, яна паступова худнее, часам гіне. Лячэнне тэрапеўтычнае; хворых жывёл дэгельмінтызуюць.

**А́ЛУНАН** (Alunāns) Адольф (11.10.1848, г. Елгава, Латвія — 5.7.1912), латышскі акцёр, рэжысёр, драматург; заснавальнік нац. т-ра і драматургіі. Сцэн. дзейнасць пачаў у 1866. Працаваў у ням. т-рах у Тарту, Таліне, Пецярбургу. Выконваў пераважна камедыйныя ролі.

Арганізатар, кіраўнік і рэжысёр першага нац. т-ра (Рыга, 1870—85), перасоўнай трупы ў Елгаве (1885—1904). Аўтар п'ес: «Дамаслы», «Радасць і гора», «Нашы продкі» і інш., артыкулаў пра тэатр. мастацтва, успамінаў.

**А́ЛУНАН** (Alunāns) Юрыс Андрэевіч (13.5.1832, маёнтак Яўнкалснава, Латвія — 18.4.1864), латышскі паэт і грамадскі дзеяч; заснавальнік нац. пісьмовай паэзіі. Скончыў Тартускі ун-т (1861). З 1862 рэдактар першай лат. газеты «Peterburgas avīzes» («Пецярбургская газета»). Аўтар зб. «Песенькі» (1856, пераклады класікаў сусв. паэзіі), эпіграм. Складальнік зб-ка навук.-папулярных артыкулаў «Двор, прырода і сусвет» (т. 1—3, 1859—61), у якім змешчаны матэрыялы па геаграфіі, гісторыі Расіі, мовазнаўстве. У вершах выступаў супраць самадзяржаўя, клерыкалізму, абуджаў нац. самасвядомасць лат. народа, удасканальваў нац. лат. мову.

*М.Абала.*

**АЛУНІ́Т** (франц. alunite ад alun галун), галыновы камень, мінерал класа сульфатаў $KaAl_3[SO_4]_2(OH)_6$. Крышталізуецца ў трыганальнай сінганіі. Шчыльныя і рыхлыя масы, радзей крышталі, валакністыя і зярністыя агрэгаты. Колер белы, шараваты, жаўтаваты, буры. Бляск шкляны да перламутравага. Цв. 3,5—4,5; кроккі. Шчыльн. 2,6—2,8 г/см$^3$. А. — сыравіна для атрымання галыну, сульфату алюмінію, часткова калійных соляў, сернай кіслаты. Гл. таксама *Алунітавая руда*.

**АЛУНІ́ТАВАЯ РУДА́**, прыроднае мінер. ўтварэнне, якое складаецца з *алуніту* (30—55%), кварцу, халцэдону і апалу (разам 40—50%), гліністых мінералаў (каалініт) і прымесяў вокіслаў жалеза, ільменіту, цыркону і інш. Шчыльная масіўная парода (каля 2,7 г/см$^3$). Фарміруецца ў абласцях маладога вулканізму. Комплексная сыравіна: атрымліваюць гліназём, сульфат калію (калійныя ўгнаенні), серную кіслату, ванадый, галій. Здабываюць звычайна адкрытым спосабам. Радовішчы ў Расіі, Азербайджане, на З Украіны, у ЗША, Кітаі, Аўстраліі, Іране, Мексіцы, Італіі, Індыі і інш.

**АЛУ́ПКА**, горад на Украіне, на Паўд. беразе Крыма. За 17 км ад Ялты. 10,8 тыс. ж. (1988). Прыморскі кліматычны курорт. Адметны мяккімі кліматычнымі ўмовамі, добрай ахаванасцю ад халодных паўн. вятроў, цёплым летам з лёгкімі марскімі брызамі, чыстым, насычаным фітанцыдамі і аэраіонамі прыгорных хваёвых лясоў горна-марскім паветрам, маляўнічым ландшафтам, працяглым перыядам марскіх купанняў (чэрв.—кастр.). Большасць санаторыяў спецыялізуецца на клімата- і фізіятэрапіі лёгачных захворванняў. Палацава-паркавы комплекс графа М.С.Варанцова (19 ст., арх. Э.Блор).

Алуніт.

**АЛУ́ШТА**, горад на Украіне, у горнай даліне на Паўд. беразе Крыма. За 45 км ад чыг. ст. Сімферопаль. 33 тыс. ж. (1992). Прыморскі кліматычны курорт. Развіваецца з 19 ст. Адметны надзвычай спрыяльнымі для паўнацэннага адпачынку, лячэння лёгачных і нерв. хвароб умовамі: клімат субтрапічны міжземнаморскага тыпу з мяккай зімой, цёплым малавоблачным летам, цёплай і працяглай восенню; марскія купанні з чэрвеня да кастрычніка; багатая вечназялёная расліннасць у далінах рэк, букавыя і хваёвыя лясы, вінаграднікі на схілах велічных горных масіваў Дэмерджы; адзін з найлепшых у Крыме пясчана-галечны пляж працягласцю каля 5 км. Шмат санаторыяў, пансіянатаў, турбаз і дамоў адпачынку. Прыродныя і архіт. помнікі (пячоры Чатырдага, «Даліна прывідаў», рэшткі візант. і генуэзскіх крэпасцяў, умацаванняў і паселішчаў, палацы, маёнткі і сядзібы Раеўскіх, Гагарыных і інш. рус. вяльможаў). Музеі краязнаўчы і С.М.Сяргеева-Цэнскага.

*Літ.:* Талышев В.П. Алушта: Путеводитель. Симферополь, 1984.

**АЛФАВІ́Т** [ад назваў першых дзвюх літар грэч. алфавіта alpha і bēta (нава-грэч. vita)], азбука, сукупнасць графічных знакаў (літар) пэўнай сістэмы пісьма, размешчаных у замацаваным парадку. Уяўляе сабой пазнейшую стадыю развіцця графікі, наступную за піктаграфічным, ідэаграфічным пісьмом (гл. адпаведныя арт.). Асн. патрабаванні да кожнага А.: дакладная колькасць адпаведных літар і асн. гукаў мовы (фанем), прастата малюнкаў літар і іх зручнасць для напісання, выразнае адрозненне адной літары ад другой пры захаванні адзінства іх графічнай будовы.

А. упершыню ўзнік у стараж. літарна-гукавых сістэмах. Яго маюць і некат. складовыя сістэмы, напр. катакана і хірагана (гл. *Японскае пісьмо*), дэванагары (гл. *Індыйскае пісьмо*) і інш. Першымі чыста гукавую сістэму пісьма стварылі фінікійцы каля 2000 г. да н.э. *Фінікійскае пісьмо* стала асновай для ўсіх наступных літарна-гукавых сістэм. Ад яго паходзіць *арамейскае пісьмо*, якое дало пачатак *яўрэйскаму пісьму* і *арабскаму пісьму*, а таксама *грэчаскае пісьмо*, на якім грунтуецца большасць еўрап. А. Грэч. А., найб. верагодна, створаны ў 11 ст. да н.э. Стараж. грэкі пакінулі без істотных змен фінікійскі А., толькі адкінулі графемы, не прыдатныя для перадачы гукаў сваёй мовы, і ўвялі некалькі новых. Грэч. А. лёг у аснову італійскіх А. (этруская, умбрыйская, оскага, лацінская, фалійскага і інш.). Пазнейшы візантыйскі варыянт грэч. А. даў пачатак арм. і груз. пісьму (гл. адпаведныя арт.).

На грэка-візантыйскай аснове ўзнікла *кірыліца*, якая перайшла ў спадчыну беларусам і інш. усх.-слав. народам. Кірыліцкі А. выкарыстоўваўся ў старабел. пісьменстве, а з пэўнымі зменамі і ў першых бел. друкаваных выданнях 16—17 ст. У 18 — пач. 20 ст. ў сувязі з яго заняпадам стаў ужывацца пераважна лацінскі А. (гл. *Лацінскае пісьмо*). З узнікненнем легальнай бел. прэсы для перадачы гукавой сістэмы бел. мовы быў прыстасаваны рус. *грамадзянскі шрыфт*. Сучасны *беларускі алфавіт* замацаваўся як асноўны графічны сродак пісьмовай формы бел. літ. мовы пасля ўтварэння БССР.

*Літ.:* Истрин В.А. Возникновение и развитие письма. М., 1965; Дирингер Д. Алфавит: Пер. с англ. М., 1963; Павлен-

Алушта.

к о Н.А. История письма. 2 изд. Мн., 1987. *А.М.Булыка.*

**АЛФЕНО́Л**, магнітамяккі сплаў жалеза (84%) з алюмініем (16%). Мае высокія магн. пранікальнасць у слабых палях, цвёрдасць, трываласць, зносаўстойлівасць, эл. супраціўленне. З А. вырабляюць стрыжні галовак апаратуры для магн. запісу і ўзнаўлення інфармацыі.

**АЛФЁРАЎ** Жарэс Іванавіч (н. 15.3.1930, Віцебск), расійскі фізік. Акад. АН СССР (1979, чл.-кар. 1972). Замежны чл. АН Беларусі (1995). Скончыў Ленінградскі эл.-тэхн. ін-т (1952). З 1953 у Фізіка-тэхн. ін-це АН СССР (Ленінград), з 1972 адначасова праф. Ленінградскага эл.-тэхн. ін-та, з 1989 старшыня Прэзідыума С.-Пецярбургскага цэнтра Расійскай АН. Навук. працы па фізіцы паўправаднікоў, паўправадніковай і квантавай электроніцы, тэхн. фізіцы. Паклаў пачатак даследаванням паўправадніковых гетэраструктур, удзельнічаў у стварэнні першых у СССР транзістараў, фотадыёдаў і магутных германіевых выпрамнікоў. Ленінская прэмія 1972. Дзярж. прэмія СССР 1984.

*Літ.:* В у л Б.М. и др. Ж.И.Алфёров // Физика и техника полупроводников. 1980. Т. 14, вып. 3.

**АЛФЁРАЎ** Мікалай Сямёнавіч (26.9.1917, г.п. Кампанееўка Кіраваградскай вобл., Украіна — 6.11.1982), рускі архітэктар. Нар. архітэктар СССР (1978). Чл.-кар. АМ СССР (1978). Скончыў Харкаўскі ін-т інжынераў камунальнага буд-ва (1940). Выкладаў у Свярдлоўскім арх. ін-це, у 1972—82 рэктар. Работы: жылыя дамы з выкарыстаннем элементаў ордэрнай архітэктуры (1955), ансамбль гіст.-рэв. сквера (1974) — усе ў Екацярынбургу. Аўтар прац па гісторыі і тэорыі прамысл. архітэктуры.

**АЛФЯРО́ВІЧЫ** (П а г о с к і я), старажытны шляхецкі род герба *«Багорыя»* ў ВКЛ. Мелі ўладанні ў Віцебскім ваяв. Ад спадчыннага маёнтка Пагосцічы зваліся А.-Пагоскія. Першы ў крыніцах згадваецца Алфер. Называюцца 11 пакаленняў прадстаўнікоў гэтага роду, вядомых па маёмасных справах сярэдзіны 16—18 ст.

**АЛХІ́МІЯ** (позналац. alchimia ад араб. аль-кімія), данавуковы кірунак развіцця *хіміі*; своеасаблівая з'ява культуры. Узнікла ў Егіпце (3—4 ст. н.э.), атрымала пашырэнне ў Зах. Еўропе (11—13 ст.). Гал. мэта — пошукі «філасофскага каменя» для ператварэння звычайных металаў у золата і серабро, атрымання эліксіру неўміручасці, універсальнага растваральніку і інш.

Тэарэт. ўяўленні А. — перапляценне рэлігійна-містычных вучэнняў язычніцтва, хрысціянства, іудаізму і ант. філасофіі. На працягу шматвяковых спробаў іх практычнага ўвасаблення алхімікі адкрылі або ўдасканалілі спосабы атрымання мінер. і раслінных фарбаў, лек. сродкаў, шкла, эмаляў, металаў і іх сплаваў, кіслот, шчолачаў, соляў, а таксама распрацавалі прыёмы хім. аперацый (фільтраванне, перагонка, узгонка і інш.). На аснове назапашаных звестак у 17—18 ст. пачалося станаўленне хіміі як навукі (працы Р.*Бойля*, М.В.*Ламаносава*, А.*Лавуазье* і інш.).

**АЛЫЧА́**, зборная назва відаў раслін з роду *сліва*. Найб. вядомы А. культурная (Prunus cerasifera) і сліва разгалістая, або ткемалі (Prunus divaricata). Вырошчваюць у краінах Азіі, Еўропы, на Балканах, Каўказе, у Закаўказзі. Выкарыстоўваюць як пладовую культуру, як прышчэпу для сліўвы, персіка, абрыкоса; для ахоўнага лесаразвядзення. На Беларусі інтрадукавана ў сярэдзіне 19 ст. з Паўн. Каўказа, пашырылася па ўсёй тэр. рэспублікі.

Дрэва або вялікі куст выш. 4—10 м. Лісце яйцападобнае або прадаўгавата-эліпсападобнае. Кветкі белыя, распускаюцца раней за лісце. Плод — касцянка, ад светла-жоўтай да цёмна-чырвонай, выспявае ў жніўні. Ураджайнасць 8—10 кг (да 40 кг) з дрэва. Сарты: Ветразь, Камета кубанская, Хуткаплодная, Падарожніца (Рубінавая), Мара і інш. Меданос. Размнажаецца насеннем, каранёвымі парасткамі і сцябловымі чаранкамі, акуліроўкай. Святлалюбівая, засухаўстойлівая, непатрабавальная да глебы і вільгаці расліна. Плады багатыя цукрамі, яблычнай і лімоннай к-тамі, вітамінамі С, $B_1$, $B_2$ і інш., з іх гатуюць кампоты, варэнне, павідла, сок, віно, на Каўказе — алычовы лаваш (высушаныя на сонцы тонкія лісты з мякаці пладоў).

Алыча.

Альбатросы: 1 — чарнаногі; 2 — беласпінны.

**А́ЛЬБА** (правансальскае alba літар. світанне), жанр сярэдневяковай куртуазнай лірыкі; ранішняя песня пра тайнае

Герцаг Альба.

начное любоўнае спатканне. Склалася ў *трубадураў*. Формаю пераважна страфічна аформлены дыялог. Параўн. «серэна» — «вячэрняя песня» — запрашэнне на спатканне (гл. *Серэнада*).

**А́ЛЬБА**, вёска ў Беларусі, у Квасевіцкім с/с Івацэвіцкага р-на Брэсцкай вобл. Цэнтр калгаса «Зара». За 23 км на З ад Івацэвічаў, 159 км ад Брэста. 101 ж., 44 двары (1995). Базавая школа. Юр'еўская царква (1790) — помнік драўлянага дойлідства.

**А́ЛЬБА** (Alba), А л ь в а р э с д э Т а л е д а (Alvarez de Toledo) Ферданда (29.10.1507 — 11.12.1582), герцаг, ісп. палкаводзец і паліт. дзеяч. Вызначыўся ў Шмалькальдзенскай вайне (1546—48) супраць ням. пратэстантаў, у вайне 1556—57 Іспаніі з папам Паўлам IV. Каралём Філіпам II прызначаны правіцелем (1507—73) у Нідэрланды, дзе ўстанавіў тэрарыст. дыктатуру (прыгаварыў да пакарання смерцю каля 7 тыс. чал., у т.л. графаў *Эгманта* і *Горна*), праводзіў палітыку абрабавання краіны і падпарадкавання яе Іспаніі (гл. ў арт. *Нідэрландская буржуазная рэвалюцыя* 16 ст.). У 1580 на чале ісп. арміі заваяваў Партугалію.

**А́ЛЬБА-ЛО́НГА** (Alba Longa), старажытны лацінскі горад на ПдУ ад Рыма. Паводле падання, засн. каля 1152 да н.э. Асканіем, сынам Энея. Каля пач. 1-га тыс. да н.э. быў цэнтрам *Лацінскага Саюза*, у 7 ст. да н.э. разбураны рымлянамі, жыхары горада пераселены ў Рым.

**АЛЬБАТРО́СЫ** (Diomedeidae), сямейства птушак атр. буравеснікападобных. 2 роды, 13 відаў. Пашыраны пераважна ў тропіках і субтропіках Ціхага, Атлантычнага і Індыйскага акіянаў.

Даўж. 0,85—1,4 м, маса да 8 кг. Апярэнне шэра-белае, крылы вузкія, доўгія, у размаху да 4,25 м. Узнімаюцца ў паветра толькі з грэбеня хвалі або берагавога абрыву. Нястомныя

летуны, добра плаваюць. Гняздуюцца калоніямі на акіянічных астравах. Размнажаюцца ва ўзросце 5—10 гадоў. Кормяцца беспазваночнымі і рыбай. А. беласпінны (Diomedea albatrus) занесены ў Чырвоную кнігу МСАП.

**А́ЛЬБАЎ** Міхаіл Нілавіч (20.11.1851, С.-Пецярбург — 25.6.1911), рускі пісьменнік. Аўтар аповесцяў «Пшаніцыны» (1873), «Дзень выніку» (1879), хронікі «Канец Невядомай вуліцы» (1881—82), рамана «Ра́са» (1883), рамант. трылогіі «Дзень ды ноч» (1890—1903), прысвечаных пераважна жыццю гар. мяшчанства і духавенства, лёсу «маленькага» чалавека (адчувальны ўплыў твораў Ф.Дастаеўскага).

*Тв.:* Соч. Т. 1—8. Спб., [1906—08].

**АЛЬБЕ́ДА** (ад лац. albus светлы), велічыня, якая характарызуе адбівальную здольнасць паверхні цела. Вымяраецца адносінамі колькасці адбітага паверхняй святла да колькасці святла, якое падае на яе. Выражаецца ў працэнтах ці долях адзінкі. А. натуральных паверхняў вымяраецца *альбедаметрам*, вывучаецца *актынаметрыяй*. Характарызуе адбівальную здольнасць нябеснага цела, якое само не свеціцца.

Адрозніваюць інтэгральнае А. — для ўсяго патоку выпрамянення, монахраматычнае — для пэўнай даўжыні хваляў, спектральнае — для розных участкаў спектра (ультрафіялетавае, бачнае, інфрачырв. і інш.). Інтэгральнае А. планеты Зямля (з атмасферай) каля 35%, у бачнай частцы спектра 40%. Залежыць ад геагр. шыраты, пары года, часу сутак, стану расліннага покрыва, воднай паверхні і інш. А. вільготнай глебы 5—10%, лесу 5—20%, травянога покрыва 20—25%, свежага снегу 70—90%. Ад велічыні А. залежыць радыяцыйны баланс паверхні Зямлі. *М.А.Гольберг.*

**АЛЬБЕДАМЕ́ТР** (ад *альбеда* + *...метр*), метэаралагічная прылада для вымярэння *альбеда*. Працуе на прынцыпе інтэгральнага шаравога *фатометра*. Альбеда зямной паверхні вымяраюць паходным А. — спалучэнне двух *піранометраў*, прыёмная паверхня аднаго з іх павернута да Зямлі і ўспрымае рассеянае святло, другога — да неба і рэгіструе падаючае выпрамяненне. Карыстаюцца і адным піранометрам, прыёмная паверхня якога паварочваецца то ўніз, то ўгару.

**АЛЬБЕ́НАЎСКАЕ ВО́ЗЕРА**, Альбенеўскае возера, у Беларусі, у Браслаўскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Дрысвята. Пл. 0,5 км². Даўж. 1,5 км, найб. шыр. 0,5 км, найб. глыб. 13 м. Пл. вадазбору 1,3 км². Схілы выш. 5—7 м, на ПнЗ да 11 м, зараслі хмызняком. Дно пясчанае, глыбей за 6 м выслана сапрапелем. Зарастае слаба. Сцёк па пратоцы ў Богінскае возера.

**АЛЬБЕ́НІС** (Albéniz) Ісаак Мануэль Франсіска (29.5.1860, г. Кампрадон, Каталонія — 18.5.1909), іспанскі кампазітар і піяніст. Вучыўся ў А.Марманцэля, Ф.Ліста (фп.), Ф.Педрэля (кампазіцыя). Буйнейшы прадстаўнік ісп. музыкі канца 19 — пач. 20 ст. Стваральнік нац. ісп. стылю, заснаванага на фалькл. рытмах і інтанацыях у спалучэнні з новымі прыёмамі пісьма. Расшырыў выразныя магчымасці фп.

*Сярод тв.:* оперы «Магічны апал» (1893), «Пепіта Хіменес» (1896), рапсодыя для арк. «Каталонія»; сарсуэлы; каля 300 тв. для фп., у т.л. «Іспанская сюіта», «Іспанія», «Іспанскія напевы» (5 п'ес), «Іберыя» (12 п'ес); раманcы, песні, балады і інш.

*Літ.:* Байсборд М. Исаак Альбенис. М., 1977.

**АЛЬБЕ́Р** (Albert; сапр. Мартэн; Martin) Аляксандр (27.4.1815, г. Бюры, Францыя — 29.5.1895), французскі сацыяліст. Удзельнік Ліёнскага паўстання 1834, адзін з кіраўнікоў тайнага рэв. т-ва 1840-х г. «Таварыства новых пораў года». Удзельнік *Рэвалюцыі 1848 у Францыі*, член Часовага ўрада Другой рэспублікі, віцэ-прэзідэнт *Люксембургскай камісіі*. Дэп. Устаноўчага сходу. За ўдзел

Альбедаметр.

у рэв. выступленні рабочых Парыжа 15.5.1848 зняволены на 20 гадоў, у 1859 амнісціраваны.

**АЛЬБЕ́Р** (Albert) Марсель (н. 25.11.1917, Парыж), французскі лётчык, удзельнік баёў на Беларусі ў Вял. Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Засл. лётчык Францыі. У 2-ю сусв. вайну змагаўся ў радах дэголеўскіх сіл «Змагарная Францыя». З 1943 у СССР у складзе авіяпалка «Нармандыя—Нёман» 1-й паветр. арміі. Зрабіў 193 баявыя вылеты, збіў 23 самалёты ворага.

**АЛЬБЕ́РДЗІ** (Alberdi) Хуан Баўтыста (29.8.1810, г. Тукуман, Аргенціна — 18.6.1884), аргенцінскі паліт. і грамадскі дзеяч, філосаф, пісьменнік. У 1838 удзельнічаў у стварэнні тайнага т-ва «Маладая Аргенціна». У 1839—52 у эміграцыі. Пасля падзення дыктатуры Х.М.*Росаса* (1852) на дыпламат. службе ў краінах Еўропы і ЗША. Аўтар працы «Асновы і зыходныя палажэнні для палітычнай арганізацыі Аргенцінскай Рэспублікі» (1852), кнігі «Злачынства вайны» (1870), драм. хронікі «Майская рэвалюцыя» (1839), паліт. рамана «Паломніцтва Светача дня, або Падарожжа і прыгоды Праўды ў Новым Свеце» (1878) і інш.

**АЛЬБЕ́РТ** (Albert Lake), возера ў Афрыцы, гл. *Мабуту-Сесе-Сека*.

**АЛЬБЕ́РТ II** (Albert) (н. 6.6.1934, Брусель), бельгійскі кароль з 1993. Скончыў ваенна-марское вучылішча ў г. Бруге, камандор ВМС. У канцы 2-й сусв. вайны дэпартаваны ў Германію, у 1950 вярнуўся ў Бельгію. Да жн. 1993 прынц, пасля смерці старэйшага брата Бадуэна — кароль (6-ы). Ганаровы прэзідэнт Нац. алімпійскага к-та.

**АЛЬБЕ́РТ ВЯЛІ́КІ** (Albertus Magnus), Альберт фон Бальштэт (Albert von Bollstädt; каля 1193, Лаўінген — 15.11.1280), нямецкі філосаф, тэолаг, прыродазнавец. Манах-дамініканец, епіскап Рэгенсбурга, папскі легат, арганізатар крыжовага паходу на тэр. Германіі. Вучыўся ў Падуі, Балонні. Выкладаў у Парыжы, Кёльне і інш.; настаўнік *Фамы Аквінскага*. Вывучаў анатомію, эмбрыялогію, батаніку, заалогію, хімію, касмалогію, оптыку. У сваіх творах даў энцыклапедычны агляд дасягненняў тагачаснай навукі. Увёў ва ўжытак сярэдневяковай філасофіі і навукі працы Арыстоцеля, якія выклаў і пракаменціраваў з пазіцый хрысціянскай тэалогіі. Сцвярджэнне пра стварэнне матэрыі і часу дало А.В. магчымасць узаконіць у рамках *схаластыкі* арыстоцелеву фізіку з яе вучэннем пра неперарыўнасць матэрыі як асновы змены. Поруч з сістэматызатарскай працай у галіне прыродазнаўства праводзіў уласныя даследаванні. Аўтар філас. прац («Сума тэалогіі» і інш.) і прыродазнаўчанавук. трактатаў. У 1931 кананізаваны каталіцкай царквой.

**АЛЬБЕ́РТА** (Alberta), правінцыя на ПдЗ Канады. Пл. 661,2 тыс. км², нас. 2545 тыс. чал. (1993). Адм. цэнтр — г. Эдмантан. Найб. гарады Калгары, Форт-Саскачэван. Гар. насельніцтва каля 77%. Значная ч. тэрыторыі занята плато Вялікія раўніны, на ПдЗ Скалістыя горы. Клімат кантынентальны. Сярэднія т-ры (у Эдмантане) студз. -15 °С, ліп. 17 °С. Ападкаў 300—500 мм за год. Найб. рэкі Піс-Рывер і Атабаска, азёры Атабаска, Клэр, Малое Нявольніцкае. Вядучае месца ў эканоміцы належыць горназдабыўной прам-сці. Здабываюць 88% нафты і газу, 40% каменнага вугалю (ад агульнай здабычы ў Канадзе), уран, серу і інш. Развіты нафтаперапрацоўка, нафтахімія, каляровая металургія, машынабудаванне, харч. прам-сць. Дае каля 20% с.-г. прадукцыі Канады. Вырошчваюць пшаніцу (каля 25%), ячмень (40%), цукр. буракі (50% ад агульнага збору ў Канадзе). Адзін з

найб. раенаў краіны па развіцці мясной і малочнай жывёлагадоўлі. Транспарт чыгуначны, аўтамабільны; нафта- і газаправоды. *З.М.Шуганава.*

**АЛЬБЕ́РТА** (Alberta), буйнейшы вугальны басейн на З Канады, у паўн. ч. Скалістых гор; невял. паўд. ч. басейна ў ЗША. Пл. больш за 250 тыс. км$^2$. Агульныя запасы больш як 228 млрд. т. 11 асн. вугледабыўных раёнаў. Інтэнсіўна распрацоўваецца з 1960-х г. У зах. ч. басейна вугалі каксавальныя, антрацыты, ва ўсх. ч. — бурыя. Каксавальныя вугалі экспартуюцца ў Японію і інш. краіны, энергетычныя выкарыстоўваюцца на мясцовых эл. станцыях. На тэр. басейна таксама здабыча серы, прыроднага газу, нафты, бітумаў і інш.

**АЛЬБЕРТУСТА́ЛЕР** (ням. Albertustaler), талерная манета, якая чаканілася з 1612 у паўд. Нідэрландах намеснікамі іспанскага караля Альбертам і Ізабелай (серабра 24,65 г). Мела агульнаеўрапейскае пашырэнне. А. наз. таксама паўд.-нідэрландскія патагоны, чаканеныя каралямі Іспаніі Філіпам IV (1621—65) і Карлам II (1665—1700), якія тыпалагічна капіравалі А. На Беларусі і Украіне яны вядомыя пад назвай «крыжовыя».

**АЛЬБЕ́РЦІ** (Alberti) Леон Батыста (18.2.1404, Генуя — 25.4.1472), італьянскі вучоны, архітэктар, пісьменнік, музыкант; адзін з найб. значных гуманістаў эпохі Адраджэння. Атрымаў адукацыю ў Падуі, працаваў у Рыме і Фларэнцыі. Аўтар тэарэт. трактатаў, якія абагульнялі вопыт тагачаснага мастацтва і ўзбагачалі яго вынікамі навукі («Пра жывапіс», «Пра дойлідства», «Пра статую»). Пабудаваныя паводле яго праектаў цэрквы Сан-Франчэска ў Рыміні (1447—68), Сан-Себасцьяна (1460) і Сант-Андрэа (1472—94) у Мантуі былі вызначальным крокам у асваенні ант. спадчыны архітэктуры ранняга Адраджэння.

*Тв.:* Десять книг о зодчестве. Т. 1—2. М., 1935—37.

**АЛЬБЕ́РЦІ** (Alberti) Рафаэль (н. 16.12.1902, в. Пуэрта-дэ-Санта-Марыя, правінцыя Кадыс, Іспанія), іспанскі паэт. Напачатку пісаў у традыцыях андалузскай нар. паэзіі (зб-кі «Марак на сушы», 1925; «Мацыёла зары», 1927). Зб. «Пра анёлаў» (1929) — самая драм. кніга ісп. паэзіі. Антыфаш. тэма ў зб-ках «Паэт на вуліцы» (1936), «Сталіца славы» (1938), «Строфы Хуана Панадэра» (1949). Пасля паражэння Ісп. рэвалюцыі 1931—39 эмігрыраваў (Аргенціна, Італія); у канцы 1975 вярнуўся на радзіму. Аўтар зб-каў «Паміж гваздзіком і шпагай» (1941), «Жывапіс» (1948), «Балады і песні ракі Парана» (1954), «Белыя вершы на кожны дзень» (1982), п'ес «Фермін Галан» (1931), «Ноч вайны ў музеі Прада» (1956), кн. ўспамінаў «Згублены гай» (1959). Прэмія М.Сервантэса 1983. На бел. мову вершы А. перакладалі М.Багун, В.Вольскі, Т.Кляшторны, М.Танк і інш.

*Тв.:* Рус. пер. — Избранное. М., 1977.
*Х.-К.Папок.*

**АЛЬБЕРЦІ́НІ** (Albertini) Джаакіна (1751—1811), італьянскі кампазітар. У 1781—84 узначальваў капэлу Радзівілаў у Нясвіжы. Дырыжыраваў операй Я.Д.Голанда «Агатка, або Прыезд пана» (1784). Да 1804 працаваў у Польшчы, потым у Рыме. Сярод твораў оперы «Дон Жуан» (паст. 1783, Варшава), «Польскі капельмайстар» (1808).

**АЛЬБІГО́ЙСКІЯ ВО́ЙНЫ 1209—29**, крыжовыя паходы, арганізаваныя папствам на Пд Францыі (вобл. *Лангедок*) супраць *альбігойцаў*. Армія крыжаносцаў складалася з паўн.-франц., часткова ням. рыцарства, яе ўзначальваў граф Сімон дэ Манфор. Нягледзячы на ўпартае супраціўленне альбігойцаў, многія іх гарады захоплены, а насельніцтва знішчана. У канцы А.в. да крыжаносцаў далучыўся са сваім войскам франц. кароль Людовік VIII, што давяршыла разгром альбігойцаў.

Да арт. **Альбертусталер**. Патагон правінцыі Брабант... 1677, Карл II.

**АЛЬБІГО́ЙЦЫ** (франц. Albigeois), удзельнікі ерэтычнага руху ў паўд. Францыі ў 12—13 ст., прыхільнікі вучэнняў катараў і вальдэнсаў. Назва ад аднаго з цэнтраў руху г. Альбі. Адмаўлялі асн. догматы каталіцкай царквы, патрабавалі ліквідаваць царк. іерархію, землеўладанне і дзесяціну. Асн. склад А. — рамеснікі, сяляне, іх падтрымлівалі рыцары і знаць, якія дамагаліся зямельных багацяў царквы. На Тулузскім саборы 1119 адлучаны ад царквы, асуджаны Усяленскім саборам 1215. Пасля *Альбігойскіх войнаў 1209—29* знаць адышла ад ерасі. Рэшткі А. знішчаны інквізіцыяй у 13 — пач. 14 ст.

**Альбінізм** у труса.

**АЛЬБІЁН** (кельцкае Albion), старажытная назва Брытанскіх астравоў (без Ірландыі). Упершыню ўпамінаецца ў творах стараж.-грэч. пісьменнікаў 6 ст. да н.э. Ужываецца і цяпер як сінонім назвы Англіі.

**АЛЬБІНІ́ЗМ** (ад лац. albus белы), прыроджаная адсутнасць нармальнай для арганізма пігментнай афарбоўкі. Выяўляецца ў адсутнасці пігментацыі скуры, валасянога покрыва, радужнай абалонкі вачэй у жывёл і чалавека, у вышэйшых раслін — зялёнай афарбоўкі ўсёй расліны або яе частак. Арганізмы з прыкметамі А. наз. альбіно́самі. А. замацоўваецца ў спадчыну рэцэсіўным генам, які блакіруе ў гомазіготным стане сінтэз пігментаў (меланіну, *хларафілу*). У чалавека і жывёл частата ўзнікнення А. — 1:20 000—40 000. А. трапляецца зрэдку сярод дзікіх жывёл, часцей сярод свойскіх і паддоследных (трусы, лабараторныя пацукі, мышы). Пашыраная форма А. ў раслін — стракаталістасць.

**А́ЛЬБІНСКАЕ ВАДАСХО́ВІШЧА**, у Беларусі, у Акцябрскім р-не Гомельскай вобл. За 27 км на З ад г.п. Акцябрскі. Створана ў 1976 для жыўлення канала ў летні перыяд і рэгулявання водна-паветранага рэжыму меліяраваных глебаў. Пл. 0,63 км$^2$. Даўж. 1,15 км, найб. шыр. 0,7 км, найб. глыб. 3,5 м, аб'ём вады 1,4 млн. м$^3$. Напаўняецца вадой помпамі з Слаўкавіцка-Ямінскага канала ў перыяд веснавога разводдзя.

**А́ЛЬБІНСКІ ПАЛА́ЦАВА-ПА́РКАВЫ АНСА́МБЛЬ.** Існаваў у 2-й пал. 16 — 2-й пал. 19 ст. ў прыгарадзе Нясвіжа Альба. Пл. больш за 200 га. На пач. 17 ст. пабудаваны эрмітаж, драўляны палац «Кансаляцыя», персіярня. Цэнтрам кампазіцыі быў 2-павярховы мураваны палац анфіладнай планіроўкі, накрыты дахоўкай і завершаны 2 вежачкамі з ляпнымі гербамі Радзівілаў.

У паўн.-зах. частцы ансамбля размяшчаліся «звярынец» (пл. каля 90 га) і фазанавае поле (пл. каля 65 га), у цэнтры — круглы вадаём з востравам і паляўнічым павільёнам, да якога сыходзіліся 8 каналаў. Пры рэканструкцыі ансамбля ў 1780-я г. (арх. Л.Лутніцкі, К.Спампані) уздоўж каналаў зроблены добраўпараджаваныя набярэжныя. На набярэжнай вял. канала стаяў драўляны касцёл св. Тройцы (з трыма пазалочанымі меднымі купаламі, 12 разнымі алтарамі) і званіца. Пабудовы ансамбля не зберагліся, часткова захаваліся паркавыя насаджэнні.

*Літ.:* Федорук А.Т. Садово-парковое искусство Белоруссии. Мн., 1989. С. 36—38.

**АЛЬБІ́Т** (ад лац. albus белы), пародаўтваральны мінерал групы *плагіяклазаў* $Na[AlSi_3O_8]$. Крышталі таблітчастыя трыклінnай сінганіі. Агрэгаты зярністыя, буйна- і дробнапласціністыя. Колер белы, жаўтаваты, чырванаваты.

Празрысты да паўпразрыстага. Бляск шкляны. Цв. б—6,5; крохкі. Шчыльн. каля 2,6 г/см³. Тыповы мінерал гранітных пегматытаў, нефелінавых і шчолачных сіенітаў і інш.; цалкам складае горныя пароды метасаматычнага паходжання — альбітыты. Выкарыстоўваецца ў шкляной, керамічнай, абразіўнай вытв-сцях.

**АЛЬБІТАФІР**, гл. *Кератафір*.

**АЛЬБІ́ЦЫЯ** (Albizia), род кветкавых раслін сям. бабовых. Каля 125 відаў. Растуць у тропіках і субтропіках, пераважна ва Усх. паўшар'і. А. ленкаранская, або «шаўковая акацыя» (A. julibrissin) трапляецца ў талышскіх лясах на Пд Азербайджана. Як дэкар. расліну разводзяць на Пд Еўропы, у Крыме, на Каўказе і ў Сярэдняй Азіі. А. серпападобная (A. falcata) — адно з найб. хуткарослых дрэў у свеце (гадавы прырост больш за 5 м).

Дрэвы ці кусты з двойчыперыстаскладанымі лістамі і кветкамі з непрыкметным венчыкам і шматлікімі доўгімі ярка афарбаванымі тычынкавымі ніткамі. Суквецці галоўчатыя або коласападобныя. Некаторыя віды маюць каштоўную драўніну і кару, багатую дубільнымі рэчывамі або сапанінамі. Выкарыстоўваюцца як тэхн., сідэратныя, кармавыя, лек. (лісце і кветкі ў Індыі ўжываюцца для лячэння праказы) і фарбавальныя расліны, а таксама для зацянення і ветрааховы плантацый чаю і кавы, аблясення пустэчаў, стварэння прысад, вытв-сці камедзі; з насення А. вырабляюць каштоўны алей для фарбаў.

**АЛЬБО́М** (франц. album), 1) пераплеценыя чыстыя лісты для малюнкаў, фатаграфій, аўтографаў, калекцый. 2) Збор рэпрадукцый, фотакартак, чарцяжоў і інш., выдадзеных у выглядзе кнігі, часта з тлумачальным тэкстам.

**АЛЬБРЫ́ХСКІ** (Olbrychski) Даніэль (н. 27.2.1945, в. Саннікі каля Варшавы), польскі акцёр тэатра і кіно. Вучыўся ў тэатр. студыі «Школа Варшаўска». З 1963 у кіно. Акцёр шырокага псіхал. дыяпазону, майстар дынамічнага малюнка ролі. Зняўся ў фільмах А.Вайды («Попел», «Усё на продаж»), Е.Гофмана («Пан Валадыёўскі», «Патоп»), К.Занусі («Сямейнае жыццё», «Структура крышталю»), Ф.Шлёндарфа («Бляшаны барабан», ФРГ), здымаўся ў Венгрыі і Італіі. У 1969—77 у Тэатры народавым: Гамлет (аднайм. п'еса У.Шэкспіра) і інш. Нац. прэмія імя З.Цыбульскага.

**А́ЛЬБРЭХТ БРАНДЭНБУ́РГСКІ** (Albrecht von Brandenburg; 17.5.1490—20.3.1568), апошні гросмайстар (з 1510) *Тэўтонскага ордэна*, першы герцаг Прусіі (з 1525). З роду *Гогенцолернаў*, сын маркграфа Фрыдрыха Брандэнбург-Ансбахскага і Соф'і — дачкі польск. караля і вял. кн. ВКЛ Казіміра IV Ягелончыка. Імкнуўся вызваліць Тэўтонскі ордэн ад васальнай залежнасці ад польск. караля і вял. кн. ВКЛ Жыгімонта I Старога (свайго дзядзькі). У 1519—21 вёў вайну з Польшчай, але пацярпеў паражэнне. Прыхільна ставіўся да ідэй лідэраў Рэфармацыі М.Лютэра і Ф.Меланхтана. Каб правесці Рэфармацыю на землях ордэна, заручыўся падтрымкай польск. караля, 8.4.1525 заключыў у Кракаве дагавор, паводле якога Прусія ператваралася ў васальнае герцагства. Абвясціў секулярызацыю Тэўтонскага ордэна і ўвядзенне ў Прусіі лютэранства. Клапаціўся аб адкрыцці ў гарадах лац. школ, гімназій і універсітэта (1544, у Кёнігсбергу), дзе набывалі адукацыю многія бел. і літ. пратэстанты. У сувязі са сваімі выдавецкімі планамі ў 1530 (?) запрасіў у Кёнігсберг «выдатнага і многавучонага мужа» Ф.Скарыну. Час праўлення А. характарызаваўся няўстойлівай паліт. сітуацыяй у Прусіі. *А.П.Грыцкевіч.*

**А́ЛЬБРЭХТ МЯДЗВЕ́ДЗЬ** (Albrecht der Bär; каля 1100—18.11.1170), першы маркграф *Брандэнбурга* (з 1157). Вёў беспаспяховую барацьбу за Саксонію, з

Альбіт.

1134 пачаў заваяванне слав. плямёнаў гавалян і люцічаў, адзін з кіраўнікоў *крыжовага паходу супраць славян 1147*. У 1150 захапіў гал. цэнтр гавалян Бранібор (пазней Брандэнбург). Пры гэтым знішчалася мясц. насельніцтва, насаджалася хрысціянства, на захопленыя землі перасяляліся каланісты з Германіі і Нідэрландаў.

**АЛЬБРЭ́ХТАЎСКІ СТЭАРЫ́НАВА-СВЕ́ЧАЧНЫ І МЫЛАВА́РНЫ ЗАВО́Д.**

Альбіцыя ленкаранская («шаўковая акацыя»).

Дзейнічаў на Беларусі ў 1836—1910 у маёнтку Альбрэхтава Пінскага пав. (цяпер у межах Пінска). Вырабляў стэарынавыя свечкі, мыла, алеін, гліцэрын. У 1862 за суткі выраблялася 50—60 пудоў (каля 1 т) свечак. У 1876—77 працавалі 213 рабочых, у 1900 — 66 чал. На Усерасійскіх выстаўках 1861, 1865 і 1870 вырабы з-да адзначаны сярэбранымі медалямі.

**АЛЬБУКЕ́РКЕ** (Albuquerque), горад на ПдЗ ЗША, штат Нью-Мексіка. Засн. ў 1706. 481 тыс. ж. (з прыгарадамі; 1990). Трансп. вузел. Міжнар. аэрапорт. Гандл.-фін. цэнтр с.-г. і горнапрамысл. (уран, каляровыя металы) раёна. Прадпрыемствы радыёэлектроннай (вытв-сць ЭВМ, сродкаў сувязі, паўправадніковых прылад), авіяц. (выраб вузлоў рухавікоў), атамнай (распрацоўка, вытв-сць і выпрабаванне ядз. зброі) прам-сці. Навук.-даследчы атамны цэнтр. Ун-т. Кліматычны курорт на выш. 1500 м.

**АЛЬБУМІНУРЫ́Я**, гл. *Пратэінурыя*.

**АЛЬБУМІ́НЫ**, простыя глабулярныя *бялкі*. Растваряюцца ў вадзе, салявых растворах, разбаўленых к-тах і шчолачах. У растворы сульфату амонію (больш за 50%) высольваюцца. Ёсць у сываратцы крыві (сываратачны альбумін), у малацэ (лактальбумін), яечным бялку (авальбумін), у насенні раслін і інш. Асн. рэзервовыя бялкі арганізма, здольныя забяспечваць звязванне і перанос крывёй вітамінаў, гармонаў (напр., з А. звязана 75—82% кортыкастэроідаў крыві). Выкарыстоўваюцца ў мед., кандытарскай, тэкст. і інш. прам-сці.

**А́ЛЬБУС** (лац. denarius albus белы дэнарый), высакапробная сярэбраная манета, якая з 2-й пал. 14 ст. выпускалася ў дзяржавах Ніжняга Рэйна, пазней у інш. ням. дзяржавах. Назва ад колеру металу. Першапачатковая агульная маса 3,9 г, чыстага серабра 3,4 г. Да пашырэння талера была асн. грашовай адзінкаю на тэр. Германіі. У канцы 17 ст. стаў разменнай манетай. На слав. землях, у т.л. на Беларусі, вядомы як «белы пенязь».

**АЛЬБЯДЗІ́НСКІ** Пётр Паўлавіч (1826, Смаленская губ. — 19.5.1883), расійскі дзярж. дзеяч, генерал ад кавалерыі (1878). Скончыў Пажаскі корпус (1843). Удзельнік баёў з горцамі на Каўказе, Крымскай вайны 1853—56. Займаўся ваенна-дыпламат. дзейнасцю, ажыццяўленнем ваен. рэформаў 1860—70-х г. У 1886—70 ліфляндскі, эстляндскі і курляндскі ген.-губернатар, камандуючы войскамі Рыжскай ваен. акругі. У 1874—80 віленскі, ковенскі і гродзенскі ген.-губернатар, камандуючы войскамі Віленскай ваен. акругі. Разглядаў мясц. памешчыкаў як сац. апору самадзяржаўя, дазволіў выданне і распаўсюджванне кніг на польск. мове, аслабіў гаценні на каталіцкую царкву ў краі. З 1880 варшаўскі ген.-губернатар, каман-

дуючы войскамі Варшаўскай ваен. акругі. З 1881 чл. Дзярж. савета Расіі.

**АЛЬБЯРЦІ́Н**, былая сядзіба, потым фабрычны пасёлак у Слонімскім р-не, з 19.1.1965 у межах г. Слонім. Узнік у 1-й пал. 19 ст. як сядзіба маршалка слонімскага В.Пуслоўскага, куды ўваходзілі палац з гасп. будынкамі і пейзажны парк (гл. *Слонімская сядзіба «Альбярцін»*). Калі ў 19 ст. побач з сядзібай узніклі прамысл. прадпрыемствы (*Альбярцінская дывановая мануфактура, Альбярцінская лесапільна-сталярная фабрыка, Альбярцінская суконная фабрыка, Альбярцінская шоўкакруцільная фабрыка, Альбярцінскі чыгуналіцейны завод, Альбярцінскі электралямпавы завод* і інш.), ператварыўся ў фабрычны пасёлак. У 1897 — 518 ж. У 1927 тут заснавана кардонная ф-ка «Альбярцін», з 1990 — нар. прадпрыемства «Альбярцін».

**АЛЬБЯРЦІ́НСКАЕ ВО́ЗЕРА**, у Беларусі, на ўсх. ускраіне г. Слонім, у бас. р. Іса. Пл. 0,5 км². Даўж. 0,75 км, найб. глыб. 8 м. Пл. вадазбору 1,2 км². Праз возера цячэ р. Іса.

**АЛЬБЯРЦІ́НСКАЯ ДЫВАНО́ВАЯ МАНУФАКТУ́РА**. Дзейнічала на Беларусі ў 1832—50 у *Альбярціне*. Вырабляла 1,5 тыс. аршынаў (1065 м) дывановых вырабаў за год. У 1847—50 працавалі 70 рабочых.

**АЛЬБЯРЦІ́НСКАЯ ЛЕСАПІ́ЛЬНА-СТАЛЯ́РНАЯ ФА́БРЫКА**. Дзейнічала на Беларусі ў 1894—1914 у *Альбярціне*. Належала акц. т-ву «Заходняруская фабрыка механічнай апрацоўкі дрэва». Вырабляла дошкі, брусы, рэйкі, дзвярныя і аконныя рамы. У 1913 працавалі 85 чалавек.

**АЛЬБЯРЦІ́НСКАЯ СУКО́ННАЯ ФА́БРЫКА**. Дзейнічала на Беларусі ў 1813—1905 у *Альбярціне*. Засн. як мануфактура. Выпускала коўдры, сукно, корт, трыко, фланель, драп. У 1858 працавалі 503 рабочыя. З 1891 працавала сельскае вучылішча. На Варшаўскай (1857) і Усерас. (Масква, 1882) выстаўках сукно ф-кі адзначана сярэбранымі медалямі.

**АЛЬБЯРЦІ́НСКАЯ ШОЎКАКРУЦІ́ЛЬНАЯ ФА́БРЫКА**. Дзейнічала на Беларусі ў 1894—1913 у *Альбярціне*. Вырабляла аснову і ўток для тканіны. У 1897 працавалі 210 рабочых; у 1910 працаваў 141 рабочы і 51 пастаўляў сыравіну і паліва.

**АЛЬБЯРЦІ́НСКІ ЧЫГУНАЛІЦЕ́ЙНЫ ЗАВО́Д**. Дзейнічаў на Беларусі ў 1828—1914 у *Альбярціне*. У 1830 пабудаваны мураваны будынак для плаўкі чыгуну. З 1845 вырабляў сячкарні і млынавыя машыны, у 1895 — сячкарні, веялкі і інш. с.-г. прылады, у 1900 — сячкарні, турбіны для вадзяных млыноў. У 1890 меў чыгуналіцейную печ і 3 такарныя станкі. З 1903 наз. машынабудаўнічы з-д. Вырабляў посуд для вінакурняў і піварварняў, у 1908—10 — драцяныя і шавецкія цвікі, шпількі, у 1913 — вадзяныя турбіны, малатарні, абсталяванне для млыноў і крупадзёрак; працавалі 50 рабочых.

**АЛЬБЯРЦІ́НСКІ ЭЛЕКТРАЛЯ́МПАВЫ ЗАВО́Д**. Дзейнічаў на Беларусі ў 1913—15 у *Альбярціне*. Першае на Беларусі прадпрыемства такога профілю. Працавалі 86 рабочых.

**АЛЬВАРЭ́С** (Alvarez) Луіс Уолтэр (13.6.1911, Сан-Францыска — 1.9.1988), амерыканскі фізік. Адзін са стваральнікаў атамнай бомбы. Чл. Нац. АН (1947). Скончыў Чыкагскі ун-т (1932). З 1936 у Каліфарнійскім ун-це (з 1945 праф.), у 1954—59 і 1976—78 нам. дырэктара Радыяцыйнай лабараторыі імя Э.Лоўрэнса (г. Берклі). Навук. працы па ат. ядз. фізіцы, фізіцы элементарных часціц, паскаральнай тэхніцы і радыёлакацыі. Адкрыў новы від радыеактыўнага ператварэння — электронны захоп (1938), пабудаваў першую пузырковую камеру, адкрыў (разам з інш.) многія рэзанансы. Нобелеўская прэмія 1968.

**АЛЬВЕАКАКО́З** (Alveococcosis), гельмінтозная хвароба жывёлы і чалавека, якая выклікаецца цэстодай Alveococcosis multilocularis. Пашыраны ў Сібіры, Сярэдняй Азіі, на Каўказе і ў інш. рэгіёнах, у т.л. на Беларусі. Трапляецца ў 2 формах — імагінальнай (узбуджальнік — дарослыя паразіты, якія лакалізуюцца ў тонкім кішэчніку лісоў, пясцоў, радзей ваўкоў, сабак і катоў) і ларвальнай (выклікаецца лічынкамі, што паразітуюць у печані, радзей у інш органах грызуноў і чалавека). Распаўсюджваецца пераважна грызунамі, дзякуючы якім утвараюцца прыродныя ачагі хваробы. Чалавек заражаецца пры заглынанні яец альвеакока з забруджаных рук. Паразіты выклікаюць атрафію пашкоджаных органаў. Лячэнне для жывёл не распрацавана, у чалавека — хірургічнае.

**АЛЬВЕ́Н** (Alfvén) Хуга (1.5.1872, Стакгольм — 8.5.1960), шведскі кампазітар, дырыжор, скрыпач. У 1890—97 саліст Каралеўскага сімф. аркестра ў Стакгольме, у 1910—39 кіраўнік муз. аддзялення ун-та ў Упсале. Упершыню ў свецкай сімф. музыцы выкарыстаў нац. фальклор. Сярод тв.: балеты «Горны кароль» (1923), «Блудны сын» (1957); 12 кантат; 5 сімфоній; 3 рапсодыі для арк.; камерныя творы; хары; музыка да кінафільмаў.

**АЛЬВЕО́ЛЫ** (ад лац. alveolus лунка, паглыбленне, пузырок), 1) канцавыя пузыркі мяшочкападобных (альвеалярных) залоз. 2) Пузыркі на канцах тоненькіх трубачак (бранхіёлаў) лёгкага млекакормячых, высланыя эпітэліем і абвітыя сеткай капіляраў, што забяспечвае газаабмен паміж альвеалярным паветрам і крывёй. 3) Лункі ў сківічных касцях вышэйшых пазваночных жывёл, у якіх знаходзяцца карані зубоў.

**А́ЛЬВЕР** (Alver) Бэці (сапр. Лэпік Элізабет; 10.11.1906, пас. Йыгева, Эстонія — 19.6.1989), эстонская пісьменніца. Нар. пісьменніца Эстоніі (1981). У 1924—27 вучылася ў Тартускім ун-це. Дэбютавала як празаік (раман «Любоўніца ветру», 1927; апавяданні). У творах А. спалучаецца лірызм з філас. асэнсаваннем рэчаіснасці. Эмацыянальна багатая і дасканалая па форме паэзія А. раскрывае адвечныя каштоўнасці жыцця (паэмы «Песня пра белую варону», 1931; «Арэхавая шкарлупіна», 1937; зб. паэм «Надтрэснутае люстэрка», 1962; зб-кі вершаў «Пыл і агонь», 1936; «Зоркавы час», 1966; «Настрой», 1976; «Лятаючы горад», 1979, і інш.). Дзярж. прэмія Эстоніі 1980. *Н.М.Басэль.*

**А́ЛЬВЫ**, у скандынаўскай міфалогіі ніжэйшыя прыродныя духі (першапачаткова, магчыма, і душы памерлых), якія ўплывалі на ўрадлівасць. Ім быў прысвечаны асобны культ. Часам А. процістаўляліся вышэйшым багам — *асам*.

**АЛЬГАДЫСМЕНАРЭ́Я** (ад грэч. algos боль + *дысменарэя*), альгаменарэя, менструацыя з болямі ў нізе жывата, галавы, ірвотай, слабасцю, стратай прытомнасці, сэрцабіццем, паніжэннем або стратай працаздольнасці. Назіраецца ў 10—20% жанчын. Першасная А. абумоўлена эндакрыннымі парушэннямі, захворваннямі цэнтр. звёнаў рэгуляцыі менструальнага цыкла (гіпофіза, гіпаталамуса), паталогіяй *палавой спеласці*. Пры балючых менструацыях у жанчын часта назіраецца адставанне не толькі ў палавым, але і ў фіз. развіцці. Выяўляюцца гарманальныя і абменныя парушэнні, паталогія працэсаў простагландзінагенезу. Другасная А. развіваецца пасля перанесеных захворванняў палавых органаў і агульнасаматычных захворванняў.

**АЛЬГАЛАГНІ́Я** (ад грэч. algos боль + lagneia юр, сладастраснасць), сексуальнае задавальненне, якое ўзнікае ад прычынення псіхічнага або фіз. болю аднаму з палавых партнёраў. Бывае актыўная, калі боль прычыняецца другому партнёру (*садызм*, эратычны тыранізм), і пасіўная, якая перажываецца індывідам у сувязі з пакутамі ад дзеянняў палавога партнёра (*мазахізм*, пакутніцтва, пасівітызм). Характэрна для паталагічных гіперролевых паводзін.

**АЛЬГАЛО́ГІЯ** (ад лац. alga водарасць + *...логія*), фікалогія, раздзел батанікі, які вывучае водарасці.

Станаўленне А. як навукі звязана з працамі замежных вучоных 19 ст. (англ. Дж. Стакхаўс і Д.Тэрнер, амер. У.Г.Харві, швед. К.А.Агард і Й.Г.Агард, ням. Ф.Т.Кютцынг і інш.), якія заклалі асновы таксанамеі і сістэматыкі водарасцяў. Развіццю сучаснай А. садзейнічалі працы рус. альголагаў Л.С.Цанкоўскага, Х.Я.Габі, І.М.Гаражанкіна, А.А.Яленкіна, М.М.Вараніхіна, У.М.Арнольдзі, К.І.Меера, на Беларусі — М.М.Гайдукова, В.Д.Акіма-

вай, Н.І.Срэценскай, Г.К.Хурсевіч, Т.М.Міхеевай, Л.В.Прасянік і інш.

У рэспубліцы н.-д. работа вядзецца ў БДУ і ін-тах АН Беларусі (эксперым. батанікі, фотабіялогіі, геалогіі), БелрыбНДІпраекце. Вывучаюцца якасны склад водарасцяў розных экалагічных груповак, колькаснае развіццё пераважна фітапланктону ў штучных і прыродных вадаёмах і рыбагадоўчых сажалках, даследуюцца праблемы фарміравання першаснай прадукцыі фітапланктону ў вадаёмах, у т.л. забруджаных, вызначаецца яго роля пры эўтрафаванні водаў і ў іх самаачышчэнні, даследуюцца водарасці перыфітону з пункту гледжання іх ролі ў працэсах самаачышчэння водных экасістэм ад радыенуклідаў, вядзецца лабараторнае культываванне некаторых водарасцяў. А. цесна ўзаемадзейнічае з *экалогіяй*. Даныя А. выкарыстоўваюцца пры ачыстцы бытавых, прамысл., сцёкавых водаў, у рыбнай і сельскай гаспадарках, харч., хім. прам-сці, бальнеалогіі і інш.

*Літ.:* Водоросли: Справ. Киев, 1989; Саут Р., Уиттик А. Основы альгологии: Пер. с англ. М., 1990. *Т.М.Міхеева.*

**АЛЬГА́МБРА** (араб. аль-хамра — чырвоная), палац-замак сярэдзіны 13 — пач. 14 ст. ў Іспаніі каля Гранады; узор познамаўрытанскай архітэктуры. Да 1492 рэзідэнцыя эміраў Гранады.

Ад горада А. аддзелена цяснінай р. Дара і абкружана мураванымі крапаснымі сценамі з вежамі. Залы (Абенсерахаў, Паслоў, Дзвюх сясцёр, Суда) групуюцца, як і інш. памяшканні А., абапал двароў — Міртавага з вадаёмам і Львінага; аздоблены мармурам, глазурай, вытанчаным разьбяным і размаляваным арнаментам, мазаікай. У ансамбль А. ўваходзіць недабудаваны палац Карла V (пачаты ў 1526, арх. П.Мачука) — помнік ісп. рэнесансавага дойлідства.

*Літ.:* Grabar O. Die Alhambra. Köln, 1981.

**АЛЬГЕ́РД** (1296 — май 1377), князь крэўскі і віцебскі, вял. князь ВКЛ [1345—77]. Сын *Гедзіміна*. Атрымаў ад бацькі Крэўскае княства. Каля 1318 ажаніўся з віцебскай князёўнай Марыяй Яраслаўнай і ў хуткім часе стаў віцебскім князем. Пасля смерці Гедзіміна, калі Вільня і велікакняжацкі

Альгамбра. Міртавы двор.

Альгамбра. Львіны двор.

пасад дасталіся яго малодшаму брату *Яўнуту*, арганізаваў супраць яго змову з братам *Кейстутам*. Кейстут заняў Вільню і захапіў Яўнута, аднак велікакняжацкі пасад дастаўся А., што сведчыла аб прызнанні Кейстутам дамінуючага месца бел. зямель у дзяржаве. А. паспяхова вёў палітыку, накіраваную на канчатковае аб'яднанне ўсх.-слав. зямель у адзінай дзяржаве. Да ВКЛ было далучана Чарнігава-Северскае княства (1340-я г.), у паліт. залежнасці ад яго апынулася Смаленскае (1350-я г.). Імкнуўся пашырыць свой уплыў на Цвярское княства, што абвастрыла яго адносіны з Масквой. Ажыццявіў 3 паходы на Маскву (1368, 1370, 1372). У *бітве каля Сініх Водаў 1362* разбіў татараў і далучыў да ВКЛ Падолле. Авалодаў Кіевам і пасадзіў там князем свайго сына Уладзіміра. У выніку барацьбы з польск. каралём Казімірам III за Галіцкую і Валынскую землі яму дасталася (1377) апошняя. Шмат разоў узначальваў войска для адпору агрэсіі Тэўтонскага ордэна. За час яго княжання тэр. ВКЛ павялічылася больш як у 2 разы, што было на карысць бел. землям, забяспечвала ім вядучае месца ў дзярж. жыцці, спрыяла развіццю эканомікі і культуры ВКЛ. *М.І.Ермаловіч.*

**АЛЬГЕ́РДАВІЧЫ**, галіна велікакняжацкай дынастыі ў ВКЛ у 14—16 ст.; нашчадкі вял. князя *Альгерда*. Мелі ўдзелы на Беларусі, Украіне і ў велікарус. землях. Ад 2 жонак (князёўнаў Марыі Віцебскай і Ульяны Цвярской) Альгерд меў 12 сыноў і 9 дачок. Усе сыны праваслаўныя, некаторыя з 1386 каталікі. Вял. князямі ВКЛ з роду А. былі сыны Альгерда *Ягайла* і *Свідрыгайла*. Нашчадкі Альгерда сыны Ягайлы наз. *Ягелонамі*. Нашчадкі Дзмітрыя Альгердавіча наз. князямі Трубяцкімі, нашчадкі Уладзіміра Альгердавіча і яго сына Алелькі (Аляксандра) — князямі *Алелькавічамі* (Слуцкімі), нашчадкі Івана Уладзіміравіча — князямі *Бельскімі*; нашчадкі Фёдара Альгердавіча — князямі *Кобрынскімі*, іх сваякі — князямі *Сангушкамі*; нашчадкі Лугвена (Лінгвена) Сямёна Альгердавіча — князямі *Мсціслаўскімі*. Часам А. намагаліся заняць велікакняжацкі пасад, карысталіся пэўнымі прывілеямі як найбліжэйшыя сваякі дынастыі Ягелонаў, засядалі ў радзе ВКЛ на спадчыннай аснове, карысталіся гербам *«Пагоня»*.

*А.П.Грыцкевіч.*

**АЛЬГІ́МУНТ**, легендарны новагародскі князь. Звесткі пра яго супярэчлівыя. У *Хроніцы Быхаўца* згадваецца як гальшанскі князь, сыну якога Міндоўту Гедзімін аддаў у кіраванне Кіеў пасля яго заваявання. У інш. крыніцах паказаны як новагародскі князь жамойцкага паходжання, то называецца сынам *Траняты*, то *Скіргайлы* ці Гольшы (міфічная асоба). Супярэчлівасць звестак абвяргае яго гіст. сапраўднасць.

**АЛЬГІ́Н** (Holguin), горад на Кубе, адм. цэнтр правінцыі Альгін. Засн. ў 1523.

194,7 тыс. ж. (1985). Вузел шашэйных дарог. Гандл.-прамысл. цэнтр с.-г. раёна. Тытунёвая, дрэваапр., тэкст., гарбарна-абутковая прам-сць; вытв-сць гумава-тэхн. вырабаў, буд. матэрыялаў, с.-г. машын. Буйны мед. комплекс.

**АЛЬГІ́НАВЫЯ КІСЛО́ТЫ**, структурныя *поліцукрыды* бурых водарасцяў і некаторых бактэрый. Малекулы пабудаваны з рэшткаў *уронавых кіслот*. Выкарыстоўваюць у харч. прам-сці (гелеўтваральнікі), на аддзелку і фарбаванне тканін, солі А.к. (альгінаты) — на выраб штучнага шоўку.

**АЛЬГІЦЫ́ДЫ** [ад лац. alga марская трава, водарасць + ...*цыд*(ы)], хімічныя рэчывы, якія знішчаюць водарасці. Найчасцей як А. выкарыстоўваюцца злучэнні з актыўным хлорам, хлорная вапна, чацвярцічныя солі амонію, многія солі і комплексы медзі. Прымяняюцца для ачысткі ў тэхн. сістэме, водазабеспячэння, прадухілення *цвіцення вады* і барацьбы з пашырэннем непажаданай альгафлоры.

**АЛЬГО́ВА**, вёска ў Беларусі, у Бабініцкім с/с Віцебскага р-на, за 4 км ад р. Зах. Дзвіна. Цэнтр акц. т-ва «Альгова». За 3 км ад чыг. ст. Віцебск. 1408 ж., 552 двары (1995). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, Дом быту, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан.

**АЛЬГО́МЕЛЬ**, вёска ў Беларусі, у Вялікамалешаўскім с/с Столінскага р-на Брэсцкай вобл. Цэнтр калгаса «Палессе». За 65 км на ПнУ ад Століна, 310 км ад Брэста, 72 км ад чыг. ст. Гарынь. 1024 ж., 321 двор (1995). Базавая школа, клуб, б-ка, бальніца, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Васкрасенская царква — помнік нар. драўлянага дойлідства (1817).

**АЛЬДАЛА́ЗЫ**, ферменты класа *ліязаў*, якія зваротна каталізуюць расшчапленне сувязяў паміж атамамі вугляроду ў вугляводах. У вял. колькасці ёсць у жывёльных, раслінных і мікраарганізмах (у мышцах млекакормячых А. да 10% ад усіх растваральных бялкоў). Маюць асабліва важнае значэнне ў працэсах анаэробнага расшчаплення цукроў, напр. пры гліколізе і фотасінтэзе. Каталізуюць рэакцыі паміж альдэгідамі і кетонамі.

**АЛЬДАСТЭРО́Н**, стэроідны гармон кары надныракавых пазваночных жывёл і чалавека. Найб. актыўны з *мінералакартыкоідаў*, стымулюе вывядзенне калію і затрымку натрыю ў арганізме, процідзейнічае яго абязводжванню. Уплыў на іонны абмен рэалізуецца праз ныркі, кішэчнік, потавыя і слінныя залозы, шчэлепы і інш. Актыўны толькі ў свабодным стане; у крыві каля 50—75% А. звязана бялкамі. Сакрэцыя рэгулюецца рэнін-ангіятэнзіўнай сістэмай, узроўнем іонаў $Na^+$ і $K^+$ у крыві, кортыкатрапінам, сератанінам. Выкарыстоўваецца як лек. сродак пры *адысонавай хваробе*.

**АЛЬДО́ЗЫ**, *монацукрыды*, якія маюць на канцы ланцуга малекулы альдэгідную групу. Адрозніваюць альдатрыёзы, альдатэтрозы, альдапентозы, альдагексозы і інш. Да А. належаць *гліцэральдэгід, глюкоза, рыбоза, галактоза* і інш., якія могуць існаваць і ў форме кетозаў.

**АЛЬДО́НА** (Ганна; 1309 ці 1310 — 26.5.1339), дачка вял. князя ВКЛ *Гедзіміна*. У 1325 (паводле інш. звестак 1323) аддадзена замуж за сына польск. караля Уладзіслава I Лакеткі Казіміра (з 1333 польскі кароль Казімір III). Гэты

Вялікі князь ВКЛ Альгерд.

дынастычны шлюб быў заключаны дзеля ўмацавання саюзу паміж ВКЛ і Польшчай з мэтаю сумеснай барацьбы супраць Тэўтонскага ордэна. Вынікам збліжэння дзяржаў стаў сумесны паспяховы паход на Брандэнбург 1326 на чале з кн. *Давыдам Гарадзенскім*.

*М.І.Ермаловіч.*

**АЛЬДРАВА́НДА** (Aldrovanda), род кветкавых раслін сям. расіцавых. Адзіны трапічны від — А. пухіраватая (A. vesiculosa). Расце ў паўд.-ўсх. раёнах Афрыкі, паўд. і цэнтр. раёнах Еўропы,

Альдраванда пухіраватая.

на Каўказе, у Сярэдняй Азіі і на Д. Усходзе. На Беларусі трапляецца ў азёрах, рачных затоках і старыцах на Палессі і ў Паазер'і. Рэдкая, занесена ў Чырв. кнігу Беларусі.

Шматгадовая насякомаедная плаваючая ў вадзе травяністая расліна без каранёў, з тонкім нітканадобным сцяблом даўж. 5—10 см і круглаватымі лістамі, сабранымі па 6—9 у кальчакі. Кожны ліст мае пласцінку з 2 акруглых палавінак з адчувальнымі валаскамі па краі (лоўчы апарат) і стрававальнымі залозкамі ўнутры. Кветкі дробныя, белыя, адзіночныя, пазушныя. Плод каробачка. Дэкар. расліна, прыдатная для акварыумаў.

**АЛЬДЭБАРА́Н**, α Цяльца, зорка 1-й *зорнай велічыні* (0,8 візуальнай зорнай велічыні), самая яркая ў сузор'і Цяльца. Чырвоны гігант, святільнасць у 150 разоў большая за сонечную. Адлегласць ад Сонца 21 пс.

**АЛЬДЭГІ́ДЫ**, клас арганічных злучэнняў, у састаў якіх уваходзіць альдэгідная група — C(O)H, звязаная з вуглевадародным радыкалам. Найпрасцейшы — *фармальдэгід*. Ніжэйшыя А. — рэчывы з рэзкім пахам, вышэйшыя $C_8$—$C_{14}$ — з прыемным. Рэакцыйназдольныя: акісляюцца да кіслот, аднаўляюцца да спіртоў, уступаюць у рэакцыі замяшчэння, далучэння, кандэнсацыі, утвараюць ненасычаныя злучэнні, цыклічныя трымеры (паральдэгід, трыаксан), лінейныя палімеры (*парафармальдэгід*), прадукты полікандэнсацыі. Атрымліваюць з любых класаў злучэнняў; некаторыя вылучаюць з расліннай сыравіны. Выкарыстоўваюць у сінтэзе палімераў (*поліфармальдэгіду, полівінілацэталяў*, аміна- і фенолальдэгідных смолаў), карбонавых кіслот, спіртоў і інш.; у вытв-сці пестыцыдаў, выбуховых, духмяных рэчываў, лекаў, фарбавальнікаў. Гл. таксама *Ацэтальдэгід, Фурфурол, Ванілін, Цытраль*.

**АЛЬДЭКО́П** Юрый Артуравіч (17.11.1918, в. Палякі Варнавінскага р-на Ніжагародскай вобл. — 31.12.1992), бел. вучоны ў галіне арган. хіміі. Чл.-кар. АН БССР (1969), д-р хім. н. (1956), праф. (1959). Скончыў Горкаўскі ун-т (1941). З 1956 у Ін-це фізіка-арган. хіміі АН Беларусі. Навук. даследаванні па сінтэзе металаарган., полігалагенарган. злучэнняў, элементаарган. пераксідаў, вывучэнні механізмаў рэакцый іх пераўтварэнняў.

*Тв.:* Введение в элементоорганическую химию. Мн., 1973 (разам з М.А.Маерам); Синтез металлоорганических соединений декарбоксилированием ацилатов металлов. Мн., 1976 (з ім жа).

**А́ЛЬДЭР** (Alder) Курт (10.7.1902, г. Хожаў, Польшча — 20.6.1958), нямецкі хімік-арганік. Скончыў Кільскі ун-т (1926). У 1936—40 навук. кіраўнік аддзела канцэрна «І.Г. Фарбэніндустры» ў Леверкузене, з 1940 дырэктар хім. ін-та Кёльнскага ун-та. Адкрыў у 1928 сумесна з О.*Дзільсам* прынцып і распрацаваў асновы *дыенавага сінтэзу*, даследаваў

яго заканамернасці (правіла А.) і стэрэахім. асаблівасці, выкарыстаў гэту рэакцыю для вывучэння хім. саставу рэчываў прыроднага паходжання (тэрпенаў, эргастэрыну і вітаміну D). Нобелеўская прэмія 1950 (разам з Дзільсам).

**АЛЬДЭРО́ГЕ** Дзмітрый Аляксеевіч (6.5.1903, Вільня — 30.4.1987), афрыканіст, этнограф, гісторык, мовазнавец.

С.Альендэ Госенс.

Чл.-кар. АН СССР (1960). Чл. франц. Т-ва афрыканістаў і Міжнар. афр. ін-та. Чл.-кар. Школы ўсх. і афр. моў (Лондан) і многіх акадэмій. Скончыў Ленінградскі ун-т (1925). У 1927—28 вывучаў мовы, этнаграфію і музейную справу ў Германіі, Нідэрландах, Бельгіі. З 1945 праф. Ленінградскага ун-та, з 1947 у Ін-це этнаграфіі Рас. АН. Асн. працы па праблемах сац. ладу, сістэмах роднасці, культуры і моў народаў Афрыкі: «Малайская сістэма роднасці» (1951), «Старажытнасці Беніна» (т. 1—3, 1953—57), «Мастацтва народаў Заходняй Афрыкі ў музеях СССР» (1958), «Мовы і пісьменства народаў Афрыкі» (1963), «Каланіяльнае грамадства» (1973) і інш.

**АЛЬЕ́НДЭ ГО́СЕНС** (Allende Gossens) Сальвадор (26.7.1908, г. Вальпараіса, Чылі — 11.9.1973), дзярж. і паліт. дзеяч Чылі. Скончыў Чылійскі ун-т (1932). Па адукацыі ўрач. Адзін з заснавальнікаў (1933) і кіраўнікоў Сацыялістычнай партыі Чылі. У 1937—41 дэп. Нац. кангрэса. У 1939—42 міністр аховы здароўя ва ўрадзе Нар. фронту. У 1945—70 сенатар (у 1966—69 старшыня сената). У 1970 выбраны ад блока Нар. адзінства прэзідэнтам краіны. Загінуў у час ваен. перавароту.

**АЛЬЗІНІ́ЦА**, рака на Пн Беларусі, ва Ушацкім р-не Віцебскай вобл., левы прыток р. Ушача (бас. Зах. Дзвіны). Даўж. 29 км. Пл. вадазбору 270 км². Выцякае з воз. Жабінок, цячэ ў межах Ушацка-Лепельскага ўзв. праз азёры Селішча і Матырына.

**АЛЬ-ІСКАНДАРЫ́Я**, горад у Егіпце, гл. *Александрыя*.

**АЛЬКАБА́ЛА** (іісп. alcabala ад араб. алькабала збіранне), падатак на гандлёвыя здзелкі ў Іспаніі (12 ст. — 1845) і яе калоніях (2-я пал. 16 — пач. 19 ст.). З 14 ст. — пастаянны дзярж. падатак. Уведзенне А. ў 1571 у *Нідэрландах* стала адной з прычын паўстання на Пн краіны ў 1572.

**АЛЬКА́ЛЬД** (іісп. alcalde ад араб. алькады суддзя), 1) дзярж. чыноўнік, які выконваў пераважна суд. функцыі ў правінцыях сярэдневяковай Іспаніі. 2) У сучаснай Іспаніі і шэрагу дзяржаў Лац. Амерыкі выбарны і зацверджаны ўрадам кіраўнік муніцыпальнай адміністрацыі; выконвае адм. і некаторыя суд. функцыі.

**АЛЬКЕ́Ж** (польск. alkierz), вуглавая частка будынка або прыбудова, накрытая асобным дахам, якая знадворку выступае за плоскасць сцен. А. атрымаў пашырэнне ў палацава-замкавым дойлідстве і сядзібных дамах Беларусі і Польшчы ў 16—19 ст. Напачатку гэта былі 2 ці 4 вежападобныя прыбудовы ў тарцах дома, накрытыя самастойнымі шатровымі дахамі (ад замкавых вежаў 16—17 ст.). З сярэдзіны 18 ст. відазмяніліся, ператварыліся ў развітыя крылы дома-сядзібы (г.п. Поразава Свіслацкага р-на Гродзенскай вобл.). Выкарыстоўваліся як спальні ці дапаможныя памяшканні.

Алькеж сядзібнага дома ў г.п. Поразава Свіслацкага раёна.

Сучасныя беларускія альманахі.

**АЛЬКЛЕ́Д** [ад *ал(юміній)* + англ. clad пакрыты], паўфабрыкат (ліст, труба) з высокатрывалага алюмініевага сплаву, пакрыты (плакіраваны) алюмініем высокай чысціні або інш. сплавам. Таўшчыня плакіравальнага слоя не менш як 35 мкм, што забяспечвае электрахім. ахову ад карозіі, зніжае стат. стамляльную трываласць матэрыялу.

**АЛЬКО́ВІЧЫ**, вёска ў Беларусі, у Вілейскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 43 км на У ад г. Вілейка і аднайменнай чыг. станцыі, 102 км ад Мінска. 56 ж., 29 двароў (1994). Пач. школа, б-ка, бальніца, амбулаторыя. Касцёл — помнік арх. неаготыкі пач. 20 ст. Званіца — помнік драўлянага нар. дойлідства канца 18 — пач. 19 ст.

**АЛЬКО́Ў** (франц. alcôve), паглыбленне або ніша ў сцяне інтэр'ера для ложка ці спальнае памяшканне без вокнаў. Узнік у архітэктуры араб. краін. Пашыраны ў палацавым дойлідстве Іспаніі, з сярэдзіны 17 ст. ў інш. еўрап. краінах, у т.л. на Беларусі.

**АЛЬМА́ГРА** (Almagro) Дыега дэ (1472? — 8.7.1538), адзін з кіраўнікоў іісп. канкістадораў, якія заваявалі Паўд. Амерыку. З 1514 у Панаме. У 1524—26 разам з Ф.*Пісара* арганізаваў 2 экспедыцыі ўздоўж зах. ўзбярэжжа Паўд. Амерыкі. Удзельнік заваявання Перу (1533), у 1535—36 узначаліў паход у Чылі. У 1537 авалодаў стараж. сталіцай дзяржавы *інкаў* г. Куска ў Перу. У выніку канфлікту з Пісара трапіў у палон. Забіты па загадзе Пісара.

**АЛЬМАДЫ́** (Almadies), мыс на п-ве Зялёны Мыс, у Сенегале. Самы зах. пункт Афрыкі (17°32' зах. даўгаты і 14°45' паўн. шыраты).

**АЛЬМАДЭ́Н** (Almadén), ртутнае радовішча ў Іспаніі, самае вял. ў свеце і унікальнае па якасці руды. Распрацоўваецца з 1-га тыс. да н.э. Руды — кварцыты ў ніжнепалеазойскіх сланцах, маюць у сабе кінавар і самародную ртуць (да $^1/_{20}$). У 1980-я г. здабыча ў межах 1,2—2 тыс. т металу. Запасы ацэньваюцца ў 250 тыс. т. Здабыча вядзецца ў глыбокіх шахтах. Самародная ртуць, якая сцякае ў ачышчальныя вырабаткі, збіраецца асобна.

**А́ЛЬМА-МА́ТЭР** (лац. alma mater літар. маці-карміцелька), старадаўняя студэнцкая назва універсітэта (якае дае «духоўны пажытак»); ужываецца як ласкальнае або жартоўнае, нярэдка ў дачыненні да інш. скончаных асобаў навуч. устаноў.

**АЛЬМАНА́Х** (ад араб. аль-манах каляндар), зборнік літаратурных твораў, часта аб'яднаных адной тэмай, жанрам і г.д.; у стараж. часы календары-даведнікі.

Першы літ. А. — «L'Almanach des muses» («Альманах музаў», Парыж, 1764—1833). Першым рус. А. лічаць «Российский Парнас» (1771). Першыя бел. А. ўзніклі як раздзелы «Календаря Северо-Западного края» (М., 1889—90) і «Северо-Западного календаря» (Мн., 1891—92). У наступныя гады выйшлі А.: «Калядная пісанка на 1904 год» (Пб., 1903, арг-цыя *«Круг беларускай народнай прасветы і культуры»*), «Велікодная пісанка» (1904, тая ж арг-цыя), *«Маладая Беларусь»* (сш. 1—3, 1912—13, бел. выдавецкая суполка *«Загляне сонца і ў наша аконца»*), «Зборнік «Нашай нівы» (вып. 1—2. Вільня, 1912; з паэмай Я.Купалы «Курган», раздзеламі «Новай зямлі» Я.Коласа і інш.), «З аколіц Дзвіны» (Віцебск, 1912, на польск. мове), «Колас беларускай нівы» (1913, лацінкаю на бел. мове, Гродзенскі гурток бел. моладзі), «Калядная пісанка, 1913 год» (Вільня, 1913, друкарня М.Кухты), «Велікодная пісанка» і «Дзень штукарства» (там жа, абодва 1914), «Могилёвский альманах за 1913 год» (Магілёў, 1914), «Літаратурны зборнік «Вольнае Беларусі» (Мн., 1917), «Зажынкі» (М., 1918, Белнацком; з творамі Я.Купалы, Я.Коласа, Цёткі, Ф.Шантыра і інш.). У 1920—30-я г. ў Сав. Беларусі выйшлі А.: літ.-навук. веснік «Адраджэнне» (Мн., 1922); «Мы ідзем» (Мн., 1929, выданне польскіх пісьменнікаў); «Уздым» (кн. 1—2, Бабруйск, 1926—28), «Камсамолія» (Мн., 1927), «Пачатак» (Віцебск, 1926), «Світанне» (Віцебск, 1927), «Наддзвінне» (Полацк, 1926), «Дняпроўскія ўсплёскі» (Магілёў, 1927; усе — філій літ. аб'яднання *«Маладняк»*); «Звенья» (1926, Мінскага аб'яднання рус. пісьменнікаў «Звенья»), «Ранне» (Магілёў, 1929, акруговых філій БелАПП), «Рытмы будавання» (Віцебск, 1931, іх жа), «Цагліна ў падмурак» (1931, Бел. секцыя Ленінградскай АПП), «Ударнікі» (з 1931, Мінская АПП, у 1932—34 выпускаў Арткамітэт СП БССР), «Літаратура і мастацтва» (кн. 1—5, Мн., 1933—36), «Бальшавіцкая моладзь» (1934), «Аднагодкі» (1935), «Бойцы» (№ 1—2, 1935—36) і інш. У Зах. Беларусі выйшлі А.: «Зборнік «Беларускіх ведамасцяў» (№ 1—3. Вільня, 1921, скл. М.Гарэцкі), «Рунь веснаходу» (Вільня, 1928, арг-цыя маладых пісьменнікаў Зах. Беларусі «Веснаход»). У Айч. вайну выходзіў А. «Беларусь» (М., 1943; Мн., 1945). Пасля вайны выдадзены А.: «Отчизна» (з 1945; з 1947 «Советская Отчизна», з 1952 часопіс, з 1960 «Нёман»), «На сонечных сцежках» (кн. 1—3, 1950—53); «Літаратурны Магілёў» (кн. 1—2, 1949—50), «Нарач» (кн. 1—2, 1957—58), «Дняпро» (1957), «Нёман» (кн. 1—2, 1956—58), «Брэст» (1958), «Літаратурны Гомель» (1958; усе абл. літ. аб'яднанняў); «Падарунак» (1958), «Узлёт» (1965), «Натхненне» (1967), «Мары юнацкія» (1969), «Універсітэт паэтычны» (1971), «Вёсны» (1977), «Вусны» (1985), «Квадра» (1990; усе літ. аб'яднання БДУ); «Дзень паэзіі» (1965—71), «Далягляды» (з 1975), «Сучаснік» (з 1977), «Братэрства» (з 1982), «Вобраз» (з 1981), «Шляхам гадоў» (вып. 1—4, 1990—94), «З гісторыяй на «Вы» (вып. 1—3, 1991—94), «Скарыніч» (вып. 1—3, 1991—95), «Краю мой — Нёман: Гродзеншчына літаратурная» (1986), «Галасы Прыдняпроўя: Магілёўшчына літаратурная» (1991), «Дзвіна: Віцебшчына літаратурная» (1992; усе — выд-ва «Мастацкая літаратура»); «Ветразь» (з 1985, выд-ва «Юнацтва»); «Свіцязь» (1989, А. бібліяфілаў, выд-ва «Беларусь»); «Культура беларускага замежжа» (кн. 1—3, 1993—94), «Беларуская драматургія» (вып. 1—2, 1994—95, абодва выд-ва «Навука і тэхніка»). З 1990 у абл. і раённых гарадах Беларусі пачалі выходзіць А.: «Ксэракс беларускі» (вып. 1—5, Полацк, 1991—94), «Магілёўшчына» (вып. 1—4, Магілёў, 1990—93), «Рунь» (вып. 1—3, Паставы, 1991—93), «Магістраль» (вып. 1—2, Гомель, 1993—94), «Дняпроўскія хвалі» (Магілёў, 1993), «Золак над Шчарай» (Слонім, 1994), «Галасы з Парнаса» (Горкі, 1995). Выд-ва «Універсітэцкае» з 1995 пачало выпускаць гіст. А. «Адраджэнне». Бел. А. выходзяць і за межамі Беларусі: «Ля чужых берагоў» (Мюнхен, 1955, выд-ва «Бацькаўшчына», з творамі Н.Арсенневай, У.Дудзіцкага, М.Кавыля, М.Сяднёва, Р.Крушыны, А.Салаўя, Х.Ільяшэвіча, Ю.Віцьбіча і інш. бел. пісьменнікаў-эмігрантаў); «Белавежа» (Беласток, 1965, 1971, 1980, з творамі бел. пісьменнікаў Беласточчыны).

*І.У.Саламевіч.*

Альмандзін.

**АЛЬМАНДЗІ́Н**, мінерал групы гранатаў $Fe_3Al_2(SiO_4)_3$. Крышталізуецца ў кубічнай сінганіі. Крышталі, суцэльныя масы. Колер фіялетава-чырвоны, густа-чырвоны да карычнявата-чорнага. Цв. 7—7,5. Шчыльн. 3,8—4,3 г/см$^3$. Тыповы мінерал рэгіянальна метамарфізаваных гліністых горных парод, а таксама ў гранулітах і зонах кантактавага метамарфізму. Пашыраны абломкавы мінерал. Радовішчы — элювіяльныя, алювіяльныя і прыбярэжна-марскія россыпы з разбураных гранатзмяшчальных крышт. сланцаў (Шры-Ланка, Індыя, Бразілія, ЗША, Расія). Абразіўны матэрыял. Празрыстыя, прыгожа афарбаваныя крышталі — каштоўныя камяні.

**АЛЬМА́НЫ**, вёска ў Беларусі, у Стружскім с/с Столінскага р-на Брэсцкай вобл. Цэнтр калгаса «Беларусь». За 21 км ад Століна, 266 км ад Брэста, 28 км ад чыг. ст. Гарынь. 1264 ж., 372 двары (1995). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Царква. Магілы ахвяр фашызму. Каля А. стаянкі эпохі неаліту.

**АЛЬМАРАВІ́ДЫ**, дынастыя берберскіх эміраў, якая правіла ў Марока і арабскай Іспаніі ў 1050—1147.

Прыйшлі да ўлады ў выніку дзейнасці ар-

Алькоў палаца ў в. Нябораў (Польшча). Канец 18 ст.

тадаксальнага рэліг. руху за першапачатковы іслам манахаў-воінаў на чале з Абдалахам ібн Ясінам (п. 1058). Найб. значны прадстаўнік А.Юсуф ібн Ташфін [1061—1107] у 1062 заснаваў г. Маракеш, да 1084 падначаліў берберскія княствы Марока і Зах. Алжыра. Паміж 1086 і 1090 ён заваяваў і аб'яднаў араб. Іспанію. А. скінуты ў 1147 *Альмахадамі*.

**АЛЬМАХА́ДЫ**, дынастыя берберскіх эміраў, якая правіла ў Марока і арабскай Іспаніі ў 1147—1269.

Засн. ў выніку дзейнасці ісламскай секты на чале з Ібн Тумартам, які змагаўся супраць рэліг. плыні *Альмаравідаў*. Пасля смерці Ібн Тумарта (1128) яго пераемнік Абд аль-Мумін [1133—63] скінуў Альмаравідаў (1147), і дзяржава А. распасцерлася на ўсю Паўн.-Зах. Афрыку. На працягу 12 ст. эміры з А. заваявалі араб. Іспанію, іх дзяржава дасягнула эканам. і культ. росквіту. Паражэнне ад хрысц. каралёў Кастыліі, Навары і Арагона ў 1212 паклала пачатак выцясненню А. з Іспаніі; імкненне да самастойнасці намеснікаў падарвала іх магутнасць у Афрыцы. У 1269 А. разгромлены *Мерынідамі*.

**АЛЬМЕ́ЙДА МЕДЫ́НА** (Almeida Medina) Кладаміра (н. 11.2.1923, г. Сант'яга), дзярж. і паліт. дзеяч Чылі. Скончыў Чылійскі ун-т. У 1952—53 міністр працы, у 1953—56 міністр гарнаруднай прам-сці, у 1970—73 міністр замежных спраў, нац. абароны ва ўрадзе С.*Альендэ Госенса*. Арыштаваны ў час ваен. перавароту (1973). У 1975 вызвалены і высланы з краіны. У 1978—89 нам. ген. сакратара, ген. сакратар Сацыяліст. партыі Чылі, старшыня Аб'яднанай сацыяліст. партыі Чылі, з 1988 старшыня Каардынацыйнага к-та сацыяліст. партый краін Лац. Амерыкі.

**АЛЬМЕ́КІ** (Olmec), індзейскі народ, які ў 14—3 ст. да н.э. насяляў тэр. сучасных штатаў Веракрус, Табаска і Герэра (Мексіка). Назва ад плямёнаў, што жылі тут у 11—14 ст. Займаліся лядным земляробствам і рыбалоўствам, былі выдатнымі разьбярамі па камені. Узвялі буйныя цырыманіяльныя цэнтры Ла-Вента, Трэс-Сапотэс і інш. Захавалася шмат помнікаў манум. скульптуры. Вядомы каменныя статуэткі істотаў, у якіх зліваюцца рысы чалавека і ягуара, — папярэднікі бога дажджу ў *майя* і інш. народаў. Іерогліфы А. не прачытаны; верагодна, на іх падставе з'явіліся іерогліфы майя. Росквіт культуры А. прыпадае на пачатак 1-га тыс. да н.э. Паміж 600 і 400 да н.э. асн. цэнтры А. былі разбураны ці пакінуты. Знікненне А., верагодна, звязана з этнічнымі міграцыямі.

**АЛЬМЕРЫ́Я** (Almeria), горад на Пд Іспаніі, у аўт. вобласці Андалусія. Адм. ц. правінцыі Альмерыя. 141 тыс. ж. (1981). Порт на Міжземным м. Харч., лёгкая, цэлюлозна-папяровая, цэментная прам-сць, вытв-сць муз. інструментаў; вінаробства. Руіны арабскай крэпасці Алькасаба (8—11 ст.), сабор (15—16 ст.).

**АЛЬМЕ́ЦЬЕЎСК**, горад у Татарстане, цэнтр Альмецьеўскага р-на, на р. Зай. 137,5 тыс. ж. (1994). Чыг. станцыя. Цэнтр нафтавай і газаздабыўной прамысловасці (вытв-сць машын і абсталявання для нафтаздабычы), машынабудаванне і металаапрацоўка, газаперапр., дрэваапр., лёгкая, харч. прам-сць; вытв-сць буд. матэрыялаў. Пачатковы пункт нафтаправода «Дружба».

**А́ЛЬМКВІСТ** (Almquist) Карл Юнас Лове (28.11.1793, Стакгольм — 26.9.1866), шведскі пісьменнік. Скончыў Упсальскі ун-т (1815). У 1851—65 у эміграцыі ў ЗША. Літ. дзейнасць пачаў як рамантык. У эпіка-драм. паэме «Амарына» (1822) паказаў распад паўфеад. грамадства. Рэаліст. адлюстраванне рэчаіснасці пераважае ў творах, сабраных пад назвай «Кніга шыпшыны» (т. 1—14, 1832—51). Аўтар раманаў «Паляўнічы замак» (1832), «Капліца», «Палац», «Шэльнурскі млын» (усе 1838), «Можна» (1839), «Габрыэль Мімансо» (1841—42), «Тры пані Смолана» (1842—43; не пазбаўлены рэліг. містыцызму); зб. вершаў «Песні» (1849). Пад уплывам ідэй утапічнага сацыялізму напісаны «Асновы еўрапейскай незадаволенасці» (1838), «Паэзія і палітыка» (1839).

*Тв.*:Samlade skrifter. Bd. 1—21. Stokholm, 1921—38. *У.Л.Сакалоўскі.*

Да арт. **Альмекі**. Каменная галава — помнік альмекскай манументальнай скульптуры.

**Альпака.**

**АЛЬПАКА́**, млекакормячае з роду ламаў, сям. вярблюдавых. Свойская жывёла высакагорнай (4200 м над узр. м.) зоны Цэнтр. Андаў Паўд. Амерыкі (мяжа Перу і Балівіі); цэнтр альпакаводства каля воз. Тытыкака. Паходжанне дакладна невядома.

Афарбоўка бурая або чорная. Галава кароткая. Кормяцца расліннасцю. Нараджае 1, зрэдку 2 дзіцянят. Гадуюць дзеля каштоўнай шэрсці (1,1—1,25 кг раз у 2 гады).

**АЛЬПЕ́НЬ**, вёска ў Беларусі, у Вельяміцкім с/с Столінскага р-на Брэсцкай вобл. За 48 км на ПнУ ад Століна, 293 км ад Брэста, 55 км ад чыг. ст. Гарынь. 698 ж., 351 двор (1994). Базавая школа. Помнік архітэктуры — царква (1888).

**АЛЬПІ́ДЫЙ** (Olpidium), род хітрыдыевых грыбоў сям. альпідыевых. Больш за 20 відаў. Трапляюцца ў Еўропе, Азіі, Паўн. Амерыцы. На Беларусі 2 віды. Найб. пашыраны А. капусны (O. brassicae) — узбуджальнік чорнай ножкі расады капусты, лёну, агуркоў, аўса, пшаніцы, памідораў, салаты, тытуню і інш.

Вегетатыўнае цела (плазмодый) аднаклетачнае. Зоаспарангіі (органы бясполага размнажэння) шарападобныя, з доўгай вывадковай трубкай, адзіночныя або па 2—12 у клетцы. Зааспоры яйцападобныя, з 1 доўгім жгуцікам. Развіваецца ва ўмовах пераўвільгатнення. Пры неспрыяльных умовах зааспоры функцыянуюць як гаметы. Цысты зімуюць у глебе. Расліны заражаюцца пасля з'яўлення семядоляў або першых лісцікаў.

**АЛЬПІЙСКАЯ ГЕАСІНКЛІНА́ЛЬНАЯ ВО́БЛАСЦЬ**, Міжземнаморскі геасінклінальны пояс, тэктанічна актыўная вобласць зямной кары, выцягнутая ад Атласкіх гор на З да Ціхага ак. на У. Ахоплівае горныя раёны Паўд. Еўропы, Міжземнае м., Паўн.-Зах. Афрыку, М.Азію, Каўказ, Іранскае нагор'е, Памір, Алай, Гіндукуш, Гімалаі, горы Індакітая і Інданезіі, якія ўтварыліся ў кайназойскай эры ў выніку *альпійскай складкавасці*. На У А.г.в. злучаецца з *Ціхаакіянскай геасінклінальнай вобласцю*. У мезазойскую эру ўяўляла сабой вял. марскі басейн (м. Тэтыс), акружаны плітамі стараж. платформаў — Афрыканскай і Індыйскай на Пд, Рускай, Сібірскай і Кітайскай на Пн. *Геасінкліналь* м. Тэтыс запаўнялася магутнымі асадкавымі тоўшчамі. У кайназоі адбылося сутыкненне паўн. і паўд. пліт і на месцы былога мора пачалася альпійская складкавасць. Утварыліся горныя сістэмы з найб. на Зямлі абсалютнымі адзнакамі (больш за 7—8 км). Асобныя структуры А.г.в. не завяршылі свайго развіцця, аб чым

сведчаць інтэнсіўныя землетрасенні і вулканізм. З тэктанічнымі рухамі ў А.г.в. звязаны некаторыя землетрасенні, што адзначаюцца на тэр. Беларусі.

**АЛЬПІ́ЙСКАЯ РАСЛІ́ННАСЦЬ**, тып высакагорнай расліннасці, пашыранай у *альпійскім поясе*. Расліны пераважна нізкарослыя, прысадзістыя, з яркімі кветкамі. Развіваюцца пры нізкіх т-рах, кароткім вегетац. перыядзе, хуткіх зменах цяпла і холаду, дастатковым увільгатненні. Тыповыя фітацэнозы — *альпійскія лугі* з пераважай злакаў (мятліц і інш.), прымул, гарычак, дубровак, уварэднікаў, астрагалаў, эдэльвейсаў, канюшыны і інш.; на камяністых участках — каменяломнік, крупкі і інш., зараснікі рададэндрану. А.р. характэрна для Альпаў, Карпат, Каўказа, Алтая, паўн., цэнтр. і ўсх. Цянь-Шаня, Гімалаяў і інш. *А.М.Матузка.*

**АЛЬПІ́ЙСКАЯ СКЛА́ДКАВАСЦЬ**, эра тэктагенезу, што адбываўся з канца мелу і пераважна ў кайназоі. Выявілася ў межах геасінклінальных абласцей, якія развіваліся ў мезазоі і раннім палеагене, завяршылася ўзнікненнем маладых горных утварэнняў — альпідаў. Да вобласці А.с. належаць складкавыя горы: у Еўропе Альпы, Пірэнеі, Андалускія, Апенiны, Карпаты, Дынарскае нагор'е, Стара-Планіна, Крымскія горы; у Азіі Каўказ, Пантыйскія, Таўр, Туркмена-Харасанскія, Эльбурс, Загрос, Сулеймановы горы, Гімалаі, складкавыя ланцугі Бірмы, Інданезіі, Камчаткі, Японскіх і Філіпінскіх а-воў; у Паўн. Амерыцы складкавыя хрыбты Ціхаакіянскага ўзбярэжжа Аляскі і Каліфорніі; у Паўд. Амерыцы Анды; таксама архіпелагі, якія акаймоўваюць Аўстралію з У, у т.л. а-вы Новая Гвінея і Новая Зеландыя. А.с. месцамі закранула і суседнія платформы — Юрскія горы і частку Пірэнейскага п-ва ў Зах. Еўропе, паўд. ч. гор Атлас у Паўн. Афрыцы, Таджыкскую дэпрэсію і паўд.-зах. адгор'і Гісарскага хрыбта ў Сярэдняй Азіі, усх. ч. Скалістых гор у Паўн. Амерыцы, Антарктычны п-аў у Антарктыдзе і інш. На тэр. А.с. захоўваецца тэктанічная актыўнасць, што выяўляецца ў моцным расчляненні рэльефу, высокай сейсмічнасці, шматлікіх дзеючых вулканах.

**АЛЬПІ́ЙСКАЯ ФІЯ́ЛКА**, гл. *Цыкламен.*

**АЛЬПІ́ЙСКІ ПО́ЯС**, прыродны вышынны пояс у гарах пераважна ўмераных і субтрапічных шырот. Размешчаны вышэй за *субальпійскі пояс*, пры значнай вышыні гор змяняецца *нівальным поясам*. Вышыннае знаходжанне А.п. вызначаецца геагр. шыратой, экспазіцыяй схілаў, ступенню кантынентальнасці клімату (напр., у Альпах А.п. знаходзіцца на выш. 2200—3000 м, на Цянь-Шані — 1000—1800 м, у Гімалаях — 3600—5000 м). Клімат суровы высакагорны. Сярэдняя т-ра студз. -15 °С, ліп. 14 °С, ападкаў 1000 мм і больш за год. Снегапады, моцныя вятры, снегавыя лавіны. Снегавое покрыва 6—10 месяцаў. Вегетац. перыяд 2—3 месяцы. Характэрны бязлессе, *альпійская расліннасць* на горна-лугавых глебах. *А.М.Матузка.*

**АЛЬПІ́ЙСКІ РЭЛЬЕ́Ф**, тып рэльефу высакагор'яў, якія ляжаць вышэй за снегавую лінію ці зведалі *зледзяненне* ў плейстацэне. Пашыраны ў Альпах, Гімалаях, на Каўказе, Памірах, Цянь-Шані і інш. Характэрны востраканечныя вяршыні і вострыя грабяні, глыбокае расчляненне, стромкія схілы, скалістасць, ледавіковыя формы рэльефу (кары, цыркі, трогі, карлінгі і інш.). Адбываюцца актыўныя працэсы снегавой і ледавіковай эрозіі.

**АЛЬПІ́ЙСКІЯ ЛУГІ́**, высакагорныя лугі *альпійскага пояса*. Найб. пашыраны асакова-злакавыя лугі і нізкатраўныя альпійскія «дываны» — *маты*, для якіх характэрна адсутнасць суцэльнага дзёрну. У складзе А.л. шмат кармавых, лекарных. Першыя фарміраванні з'явіліся ў канцы 18 ст. ў Францыі, прызначаліся для баявых дзеянняў у Альпах (адсюль назва) і складаліся ў асн. з жыхароў горных раёнаў. Назва захавалася ў Францыі, Італіі і некаторых інш. краінах як сінонім паняцця «горныя» і «горнапяхотныя» войскі, якія ўваходзяць у склад сухапутных войскаў (гл. таксама *Горныя войскі*).

**АЛЬПІНА́РЫЙ**, камяністы сад, участак у бат. садзе, скверы або парку, створаны для вырошчвання горных (альпійскіх) раслін ва ўмовах, набліжаных да натуральных; дэкар. А. наз. таксама ракарыем. У бат. садах А. ствараюць у навук. мэтах на штучных узгорках, дзе экспануюцца расліны пэўных горных раёнаў. Найбольшы ў рэспубліцы А. у Цэнтр. бат. садзе АН Беларусі. А. — адна з формаў дэкар. афармлення паркаў і сквераў. З бел. флоры ў А. выкарыстоўваюць дуброўкі, кураслепы, чубаткі, мінушкі, бурачок скальны, аўсяніцы і інш.

Альпійдый капусны: 1 — плазмодый і зіготы грыба ў клетках кораня; 2 — зааспарангіі; 3 — зааспоры; 4 — пашкоджаная расада капусты («чорная ножка»).

Альпійскія лугі.

Альпінарый.

**АЛЬПІНІ́ЗМ**, від спорту, узыходжанне на цяжкадаступныя горныя вяршыні ў спартыўных ці інш. мэтах.

Афіц. гісторыя А. пачынаецца з 1786 (узыходжанне швейцарцаў Ж.Бальмы і М.Пакара

на Манблан у Альпах). З 2-й пал. 19 ст. ўзнікаюць альпінісцкія клубы ў Англіі, Аўстрыі, Італіі, Швейцарыі, Расіі і інш. Да канца 19 ст. ў Альпах былі адолены многія вяршыні, пракладзены складаныя маршруты. Па меры вывучэння і даследавання інш. горных сістэм, удасканалення сродкаў зносін пашыралася геаграфія А., які актыўна развіваецца з 1950-х г. пасля пакарэння найвышэйшых вяршыняў свету (гл. табл.).

А. патрабуе добрай фізічнай і спец. падрыхтоўкі, спец. адзення, абутку, харчавання для жыццезабеспячэння ва ўмовах высакагор'я і адпаведнага рыштунку (вяроўкі, ледарубы, скальныя і лёдавыя кручкі, карабіны і інш.) для страхоўкі спартсменаў. Пры ўзыходжанні на вяршыні вышынёй больш за 8 000 м часта выкарыстоўваюць кіслародныя апараты. У А. прынята класіфікацыя маршрутаў паводле іх складанасці (усяго 6 катэгорый). Альпінісцкую падрыхтоўку атрымліваюць у спец. альплагерах ці школах. Узыходжанні робяць, як правіла, у складзе групы, з інструктарам або гідам-правадніком (на пач. этапе) ці самастойна. У горных раёнах дзейнічае спец. горнавыратавальная служба. Нац. федэрацыі і альпінісцкія саюзы розных краін аб'яднаны (з 1932) у Міжнар. саюз альпінісцкіх асацыяцый (УІАА). Праводзяцца *альпініяды*.

На Беларусі А. развіваецца з 1950-х г. Дзейнічае (з 1955) федэрацыя А. і *скалалажання*. З 1973 праводзіцца першынство краіны па А. Бел. альпіністы — удзельнікі і прызёры чэмпіянатаў СССР і СНД па А. Імі зроблены ўзыходжанні на вышэйшыя (больш за 8000 м) вяршыні свету ў Гімалаях: Э.Ліпень (Джамалунгма, 1990, 1993, Шыша-Пангма, 1992, разам з І.Велянковай), В.Кульбачэнка (Канчэнджанга, 1994). Восенню 1994 адбылася першая бел. экспедыцыя (з удзелам рас. і балг. альпіністаў) у Гімалаі.

*Літ.:* Х у б е р Г. Альпинизм сегодня: Пер. с нем. М., 1980. *Г.К.Кісялёў.*

**Першаўзыходжанні на вышэйшыя вяршыні свету**

| Вяршыня, яе вышыня (м), назва горнай сістэмы | Альпіністы | Год узыходжання |
|---|---|---|
| Анапурна, 8078 (Гімалаі) | М.Эрцог, Л.Лашэнель (Францыя) | 1950 |
| Джамалунгма (Эверэст), 8848 (Гімалаі) | Э.Хілары, Тэнцынг Наргэй (Вялікабрытанія) | 1953 |
| Нангапарбат, 8125 (Гімалаі) | Г.Буль (Аўстрыя) | 1953 |
| Чагары (К-2), 8611 (Каракарум) | Л.Лачадэлі, А.Кампаньёні (Італія) | 1954 |
| Чо-Аю, 8153 (Гімалаі) | Г.Ціхі, С.Іохлер (Аўстрыя) Пасанг Дава Лама | 1954 |
| Макалу, 8481 (Гімалаі) | Ж.Франко са спадарожнікамі (8 чал., Францыя) | 1955 |
| Канчэнджанга, 8597 (Гімалаі) | М.Бенд, Н.Хардзі, Д.Браўн, Т.Стрэчэр (Вялікабрытанія) | 1955 |
| Манаслу, 8156 (Гімалаі) | Т.Іманісі, К.Като, М.Сігета (Японія), Гіяльцэн Нурбу | 1956 |
| Лхацзе, 8545 (Гімалаі) | Э.Рэйс, Ф.Лусінгер (Швейцарыя) | 1956 |
| Гашэрбрум, 8035 (Каракарум) | Ф.Моравец, Г.Віленпарт, С.Ларх (Аўстрыя) | 1956 |
| Броўд-пік, 8047 (Каракарум) | М.Шмук, К.Дзімбергер, Г.Буль, К.Вінтэрштэлер (Аўстрыя) | 1957 |
| Хідэн-пік, 8068 (Каракарум) | П.Шоенінг, А.Кауфман (ЗША) | 1958 |
| Дхаўлагіры, 8172 (Гімалаі) | А.Шэльберт, К.Дзімбергер і інш. (8 чал., Швейцарыя) | 1960 |
| Шыша-Пангма (Гасаінтан), 8013 (Гімалаі) | Шу Чын, Ван Фучжоу і інш. (10 чал., Кітай) | 1964 |

**АЛЬПІНІ́ЯДА**, масавыя спартыўныя мерапрыемствы па *альпінізме*. Праводзіцца з вучэбнымі (абучэнне асновам альпінізму) ці спарт. (падрыхтоўка спартсменаў-разраднікаў) мэтамі. Часам прымяркоўваецца да святкавання пэўных знамянальных дат (юбілейныя А.). Першая бел. А. адбылася ў 1960 на Каўказе.

**А́ЛЬПЫ** (ням. Alpen, франц. Alpes, італьян. Alpi ад кельцкага alp высокая гара), найвышэйшая горная сістэма Зах. Еўропы на тэр. Францыі, Італіі, Швейцарыі, Аўстрыі, Ліхтэнштэйна, Германіі і Славеніі. Даўж. каля 1200 км, шыр. да 260 км, найб. выш. г. Манблан (4807 м). А. — складаная сістэма горных масіваў і хрыбтоў, што працягнуліся дугой ад Міжземнага м. да Сярэднедунайскай раўніны. Папярочная даліна між азёрамі Бодэнскім і Кома падзяляе А. на больш вышынныя Зах. А. і больш нізкія і шырокія Усходнія. У Заходніх вылучаюць Прыморскія, Коцкія, масіў Пельву, Грайскія, Савойскія (з масівам Манблан), Бернскія і інш. Горны ланцуг Усходніх А. прадстаўлены Рэтыйскімі, Эцтальскімі, Цылертальскімі А., Высокім і Нізкім Таўэрнам. А. належаць да маладых складкавых структур альпійскага арагенезу (гл. *Альпійская складкавасць*). Характэрны зубчатыя грабяні, глыбокае расчляненне, вял. пашырэнне ледавіковых формаў рэльефу (гл. *Альпійскі рэльеф*). Восевая зона сфарміравана стараж. крышталічнымі (гнейсы, слюдзяныя сланцы), магматычнымі (граніты) і метамарфічнымі (кварцава-філітавыя сланцы)ародамі. Перадгор'і А. складзены з вапнякоў, мергеляў, даламітаў, філітаў і маладых маласавых фармацый. Карысныя выкапні: жалезныя, медныя, уранавыя руды, магнезіты, баксіты, каменная соль, у невял. колькасці каменны і буры вугаль.

А. — важны кліматападзел Еўропы. На паўн. і зах. перадгор'ях клімат умераны, вільготны, на паўднёвых — субтрапічны міжземнаморскі. Ва ўнутр. раёнах гор выразная вертыкальная занальнасць (т-ра паніжаецца праз кожныя 100 м на 0,3—0,7 °С), фёнавыя вятры выклікаюць кароткія рэзкія пацяпленні. Ападкаў на наветраных зах. і паўн.-зах. схілах 1500—2000 мм за год (месцамі 4000 мм), ва ўнутр. горных далінах 500—800 мм. Снегавая лінія на выш. ад 2500 м на ПнЗ да 3500 м у найб. сухіх унутр. і ўсх. раёнах. Характэрна сучаснае зледзяненне (каля 1200 ледавікоў агульнай пл. 3 тыс. км). З ледавікоў пачынаюцца рэкі Рона, Рэйн, По, Адыджэ, Ін, Драва і інш. Азёры ле-

Да арт. Альпінізм. Удзельнікі беларускай экспедыцыі ў Гімалаі. 1994.

давіковага і тэктанічна-ледавіковага паходжання: Жэнеўскае, Бодэнскае, Лага-Маджорэ, Кома (глыб. да 410 м). Для А. характэрна вышынная пояснасць (вылучаюць 5 ландшафтных паясоў).

Пояс перадгор'яў і горных схілаў да выш. 800 м. Клімат умераны, цёплы, на паўд. схілах з міжземнаморскімі рысамі; букавыя і дубовыя лясы значна высечаныя; сады, вінаграднікі, палі збожжавых на горных бурых глебах. Пояс гор. (на выш. 800—1800 м) з умераным і ўмерана вільготным кліматам заняты шыракалістымі (дуб, бук, клён, граб) лясамі, якія змяняюцца хваёвымі (елка, піхта, еўрап. кедр, лістоўніца) на горных бурых лясных ападзоленых глебах. Пашы і агароды да 1100—1400 м. На выш. 1800—2300 м субальпійскі пояс з халодным кліматам, моцнымі вятрамі, доўгатэрміновым снегавым покрывам, пераважна высакагорнай хмызняковай расліннасцю (рададэндран, ядловец, кедравы сланік і інш.) і субальпійскімі лугамі. Вышэй (да граніцы вечнага снегу) альпійскі пояс з суровым халодным кліматам і *альпійскімі лугамі* і нівальны пояс (вечных снягоў і ледавікоў); ландшафты халодных высакагорных камяністых ледавіковых і снежных пустыняў.

А. — адзін з важнейшых рэкрэацыйных раёнаў Еўропы. Цэнтр альпінізму, турызму, гарналыжнага спорту.

*Літ.:* Благоволин Н.С., Серебрянный Л.Р. Рельеф Европы // Рельеф Земли. М., 1967; Ерамов Р.А. Физическая география Зарубежной Европы. М., 1973; Жучкевич В.А., Лавринович М.В. Физическая география материков и океанов. Ч. 1. Евразия. Мн., 1986. *Г.Я.Рылюк.*

Альпы.

**АЛЬПЯРО́ВІЧ** Леў Абрамавіч (4.12.1874, в. Куранец Вілейскага р-на Мінскай вобл. — 1913), бел. жывапісец. Вучыўся ў Вільні ў рысавальнай школе І.*Трутнева*, скончыў Пецярбургскую АМ (1902), вучань І.*Рэпіна*. З 1902 жыў у Мінску. У творчасці адстойваў прынцыпы рэалізму. Пісаў партрэты, пейзажы, бытавыя кампазіцыі («Вечар у сям'і», «Краўчыхі», «Муляры», «Партрэт бабулі», «Партрэт музыканта Жухавіцкага», «Жаночы партрэт», «Дзяўчына ў чырвоным шаліку»), блізкія да твораў перасоўнікаў. Садзейнічаў арганізацыі выстаўкі перасоўнікаў у Мінску (1899). Творы А. найб. поўна (230 работ) былі сабраны на выстаўцы ў Мінску ў 1939.

Л.Альпяровіч. Жаночы партрэт. 1904. Нацыянальны мастацкі музей Беларусі.

**А́ЛЬСМІК** Пётр Іванавіч (27.2.1907, в. Выдрэя Лёзненскага р-на Віцебскай вобл. — 2.4.1992), бел. селекцыянер-бульбавод. Акад. АН Беларусі (1966), акад. УАСГНІЛ (1979). Чл.-кар. Акадэміі с.-г. н. ГДР (1974). Д-р с.-г. н. (1954). Герой Сац. Працы (1966). Скончыў БСГА (1929). З 1929 на Навазыбкаўскай с.-г. доследнай станцыі, у 1931—41 і 1944—56 на Бел. селекцыйнай станцыі. З 1956 у Бел. НДІ бульбаводства і плодаагародніцтва. Навук. працы па селекцыі гароднінных культур. Распрацаваў прыёмы селекцыі бульбы на ранняспеласць, высокія крухмалістасць і колькасць бялкоў у клубнях, устойлівасць да раку. Вывеў больш за 10 высокаўраджайных, з добрымі смакавымі якасцямі і вял. (да 26%) колькасцю крухмалу сартоў бульбы: Агранамічную, Тэмп, Лошыцкую, Раз-

варыстую і інш. Дзярж. прэміі СССР 1951, 1974. Залаты медаль імя І.У.Мічурына УАСГНІЛ (1980).

*Тв.:* Селекция картофеля в Белоруссии. Мн., 1979.

*Літ.:* П.І.Альсмік // Весці АН БССР. Сер. с.-г. навук. 1977. № 1.

**АЛЬТ** (італьян. alto ад лац. altus высокі), 1) нізкі жаночы ці дзіцячы голас у хоры; 2-я па вышыні партыя ў харатоўка». 3) Разнавіднасці многіх аркестравых інструментаў: духавых (флейта-А., габой-А., кларнет-А., труба-А., трамбон-А.), струнных (цымбалы-А., мандаліна-А., балалайка-А., домра-А.).

*І.Дз.Назіна.*

П.І.Альсмік.

вой партытуры. Да 18 ст. назва высокага *тэнара*. 2) Муз. інструмент класа хардафонаў тыпу смыковых. Мае тую ж канструкцыю, што і *скрыпка*, але большых памераў, густы, насычаны гук, строй квінтай ніжэй. Мяркуюць, створаны на мяжы 15—16 ст. На Беларусі вядомы з 18 ст., выкарыстоўваўся ў ансамблях і з аркестрам; нар. назва «аль-

**АЛЬТАІ́Р**, α Арла, зорка 1-й *зорнай велічыні* (0,8 візуальнай зорнай велічыні). Святільнасць у 9 разоў большая за сонечную. Адлегласць ад Сонца 5 пс. З *Вегай* і *Дэнебам* утварае вял. летні трохвугольнік.

**АЛЬТАМІ́РА** (Altamira), пячора ў правінцыі Кантабрыя (Іспанія). У 2-й пал. 19 ст. тут выяўлены наскальныя рознакаляровыя выявы жывёл, стаянка эпохі *салютрэ* і ранняга *мадлену*. Даўжыня пячоры каля 280 м (з шэрагам залаў). Памеры намаляваных фігур (бізонаў і інш.) да 2,25 м. Паводле радыевугляроднага аналізу малюнкі зроблены каля 15500 г. назад. А. — найб. значная па мастацкім багацці «галерэя» першабытнага чалавека.



Выявы бізонаў у пячоры **Альтаміра**.

**АЛЬТАМІ́РА-І-КРЭВЕ́А** (Altamira y Crevea) Рафаэль (10.2.1866, г. Алікантэ, Іспанія — 1.6.1951), іспанскі гісторык. Скончыў Валенсійскі і Мадрыдскі ун-ты. З 1888 сакратар Пед. музея (Мадрыд). У 1897—1910 узначальваў кафедру гісторыі ісп. права ў г. Аўеда, пазней праф. Мадрыдскага ун-та. У асноўнай працы «Гісторыя Іспаніі і іспанская цывілізацыя» (т. 1—4, 1900—11) даследаваў эканам. і сац. гісторыю краіны, падкрэсліў узаемасувязь эканам. і паліт. заняпаду Іспаніі ў 16—17 ст. Пасля ўстанаўлення фаш. дыктатуры Ф.Франка (1939) у эміграцыі.

**АЛЬТА́НКА**, альтана (італьян. altana), драўляная ці мураваная дэкар. пабудова каркаснай (слупавой) канструкцыі для адпачынку, аховы ад сонца і ападкаў. Звычайна размяшчаецца ў маляўнічых кутках паркаў, гар. і прыгарадных зялёных зон, у дварах жылых дамоў, каля вадаёмаў і г.д. Найчасцей вырашалася ў выглядзе *ратонды* ў пейзажных і рэгулярных парках стыляў барока і класіцызму. У мураваных А. стылю класіцызму выкарыстоўваліся шмат'ярусныя ордэрныя кампазіцыі.

**АЛЬТА́НКАВЫЯ ПТУ́ШКІ**, альтаншчыкі, буданнікі (Ptilonorhynchidae), сямейства пеўчых птушак атр. вераб'інападобных. 8 родаў, 18 відаў. Жывуць у трапічных лясах Новай Гвінеі з прылеглымі астравамі і на Пн і У Аўстраліі. Найб. вядомы альтаншчык атласны (Ptilonorhynchus violaceus).

Даўж. 22—40 см. Апярэнне бурае, цёмнасіняе або фіялетавае. У большасці моцныя дзюба і ногі, кароткі хвост. Многім відам характэрны палавы дымарфізм: самцы прыгажэйшыя за самак. Робяць з галінак і травы своеасаблівыя буданы або альтанкі (адсюль назва) даўж. да 1 м, выш. да 50 см для спароўвання. Пляцоўку перад імі ўпрыгожваюць пер'ем, ракавінамі, бліскучымі каменьчыкамі, насякомымі, кветкамі. Гнёзды на дрэвах, у кладцы 1—3 яйцы. Наседжвае самка. Усёедныя. Здольныя да гукапераймання.

**АЛЬТА́НШЧЫКІ**, гл. *Альтанкавыя птушкі*.

**А́ЛЬТДОРФЕР** (Altdorfer) Альбрэхт (каля 1480, г. Рэгенсбург, Германія — 12.2.1538), нямецкі жывапісец і графік эпохі Адраджэння. Стаяў на чале *дунайскай школы*. Адзін з пачынальнікаў пейзажа ў зах.-еўрап. жывапісе. Высокая чалавечнасць вобразаў і напружаны каларыт, уласцівыя яго жывапісу, увасоблены ў алтары св. Фларыяна манастыра ў Санкт-Фларыяне (Аўстрыя, 1518), партрэтах («Партрэт невядомай жанчыны», 1525). У праграмным творы «Бітва Аляксандра Македонскага з Дарыем» (1529) выявілася касм. светаадчуванне мастака. Удасканаліў тэхніку афорта: вынайшаў спосаб траўлення медзі.

**«АЛЬТО́НА»** (Altona — прыгарад Гамбурга), кодавая назва карнай аперацыі ням. фашыстаў супраць партызан, якія выйшлі з акружэння ў ходзе карнай аперацыі *«Гамбург»*. Праводзілася ў 2-й пал. снеж. 1942 у Івацэвіцкім, Ганцавіцкім, Ляхавіцкім, Баранавіцкім р-нах Брэсцкай вобл. сіламі 14-га паліцэйскага палка СС, спец. камандамі паліцыі бяспекі, СД і інш. карнымі баявымі групамі. Карнікі тыдзень беспаспяхова праследавалі партызан, учынілі

Альтанкі.

Альтанкавая птушка.

крывавую расправу над мірнымі жыхарамі. У ходзе аперацыі гітлераўцы расстралялі і спалілі жывымі больш за тысячу дзяцей, жанчын і старых.

**АЛЬТРУ́ІЗМ** (франц. altruisme ад лац. alter іншы), бескарыслівыя клопаты пра шчасце і дабрабыт інш. людзей, гатоўнасць ахвяраваць асабістымі інтарэсамі. Тэрмін увёў у 1830-я г. франц. філосаф А.Конт, які звязваў маральнае ўдасканаленне чалавека з выхаваннем у людзей пачуцця А., процілстаўляючы яго *эгаізму*. Асобныя ідэі А. развіваліся ў раннім хрысціянстве, у вучэнні Францыска Асізскага (сярэднявечча), у новы час — асветнікамі (І.Гердэр, А.Шэфтсберы, Д.Юм, А.Сміт, Ж.Ж.Русо, І.В.Гётэ і інш.). Канкрэтныя формы А. — *міласэрнасць, дабрачыннасць*, філантропія і інш.

**АЛЬТУ́ЗІЙ** (Althusius) Іаган (1557, Дзідэнсгаўзен, Паўн. Рэйн-Вестфалія, Германія — 12.8.1638), нямецкі юрыст, тэарэтык права. Атрымаў адукацыю ў Базельскім ун-це. У 1586—1604 праф. права ў Гербарне. З 1604 бургамістр, з 1627 старшыня кальвінісцкай кансісторыі г. Эмдэн. У сваёй гал. працы «Палітыка...» (1603) адзін з першых абгрунтаваў тэорыі *натуральнага права* і *грамадскага дагавору*. Развіваў і сцвярджаў ідэю вяршэнства і неадчужальнасці нар. суверэнітэту, перад якім адказныя носьбіты дзярж. улады.

**АЛЬТФА́ТЭР** Васіль Міхайлавіч (4.1.1883, Варшава — 20.4.1919), расійскі ваенна-марскі дзеяч, контр-адмірал (1917). Скончыў Марскую акадэмію (1908). Служыў на Балт. флоце, у Марскім ген. штабе. Удзельнік рус.-яп. вайны 1904—05. У 1-ю сусв. вайну прадстаўнік ВМФ, нач. Ваенна-марскога ўпраўлення пры галоўнакамандуючым Паўн. фронтам. Быў экспертам на перагаворах аб міры ў Брэсце. З 1918 на камандных пасадах у сав. ВМФ, у т.л. чл. РВС і першы камандуючы Марскімі сіламі Рэспублікі.

**АЛЬТШУ́ЛЕР** Сямён Аляксандравіч (24.9.1911, г. Віцебск — 1983), савецкі фізік. Чл.-кар. АН СССР (1976). Скончыў Казанскі ун-т (1932), дзе працаваў з 1935 (з 1955 праф.). Навук. працы па радыёспектраскапіі і парамагнетызме. У 1934 сумесна з І.Я.*Тамам* выказаў ідэю аб існаванні ў нейтрона магн. моманту і дакладна вызначыў яго знак і велічыню. Прадказаў і даў тэорыю акустычнага парамагн. рэзанансу (1952). Прапанаваў метад атрымання звышнізкіх тэмператур, заснаваны на адыябатычным размагнічванні ядз. спінаў.

*Тв.*:Электронный парамагнитный резонанс соединений элементов промежуточных групп. 2 изд. М., 1972 (разам з Б.М.Козыравым).

**АЛЬТШУ́ЛЬ** Алена Барысаўна (н. 4.4.1964, Мінск), бел. спартсменка (міжнар. стаклетачныя шашкі). Скончыла Бел. ін-т нар. гаспадаркі (1985). Чэмпіёнка (1980, 1982—84, 1986), віцэ-чэмпіёнка (1979, 1987) свету ў асабістым першынстве. Чэмпіёнка СССР у асабістым першынстве (1978, 1979, 1982). Пераможца і прызёр усесаюзных спаборніцтваў. З 1991 жыве ў Германіі

**АЛЬТЫМЕ́ТР**, гл. ў арт. *Вышынямер*.

**АЛЬТЫПЛА́НА** (Altiplano), заходняя частка ўнутр. пласкагор'я Цэнтр. Андаў Паўд. Амерыкі, у Перу і Балівіі. Займае катлавіны (днішчы) вял. азёраў, якія існавалі ў плейстацэне. Ляжыць на выш. 3300—3800 м. Алювіяльныя раўніны, азёры — Тытыкака і Паапо, саланчакі Уюні і Кайпаса (рэшткі стараж. азёраў), вулканічныя плато і асобныя масівы (да 5300 м). Клімат высакагорны, трапічны. Сярэднямесячныя т-ры ад 6 да 11 °С. А. — вобласць унутр. сцёку, гал. р. Дэсагуадэра. На Пн, дзе выпадае 500—700 мм ападкаў за год, — горны злакавы стэп, на З і Пд (ападкаў да 300 мм) — пустынная і паўпустынная расліннасць. А. — найб. заселеная ч. Балівіі.

А.Альтдорфер. Партрэт невядомай жанчыны. 1525.

**АЛЬТЭРА́ЦЫЯ** (ад лац. alteratio змяненне) у музыцы, 1) павышэнне або паніжэнне ступені асн. гукарада без змены яе назвы. Знакі А.: ♯ (дыез, павышэнне на паўтон), ♭ (бемоль, паніжэнне на паўтон), 𝄪 (дубль-дыез, павышэнне на тон), 𝄫 (дубль-бемоль, паніжэнне на тон), ♮ (бекар, адмаўленне ад папярэдняга павышэння ці паніжэння гуку). Знакі А., выстаўленыя ў пач. нотнага радка пры ключы, дзейнічаюць ва ўсіх актавах, пакуль іх не зменяць, знакі А. перад нотай (выпадковыя) — толькі ў адной актаве ў межах аднаго такта. 2) У вучэнні аб гармоніі — адзін з тыпаў храматыкі (гл. *Храматызм*).

Альтыплана. Паўпустынны ландшафт.

**А́ЛЬТЭРМАН** (Altermann) Тэадор Юр'евіч (24.11.1885, в. Равіла, Эстонія — 31.3.1915), эстонскі акцёр. Творчую дзейнасць пачаў у 1902. Адзін з арганізатараў і акцёр (з 1906) т-ра «Эстонія». Стварыў яркія вобразы Лео Саалепа і Пійбілехта («Няўлоўны цуд» і «Дамавік» Э.Вільдэ), Барона («Скупы рыцар» А.Пушкіна), Атэла, Гамлета (аднайм. п'есы У.Шэкспіра). Ігра А. вылучалася майстэрствам пераўвасаблення, унутранага маналога. Як рэжысёр паставіў «Няўлоўны цуд», «Маскарад» М.Лермантава, «Без віны вінаватыя» А.Астроўскага і інш.

**АЛЬТЭРНАНТЭ́РА** (Alternanthera), тэлантэра, род кветкавых раслін сям. аксамітнікавых. Каля 200 відаў. Растуць у тропіках і субтропіках Амерыкі і Аўстраліі. На Беларусі некалькі відаў: А. рознакаляровая (A. versicolor), прыемная (A. amabilis), прыгожая (A. amoena) і інш., вырошчваюцца ў адкрытым грунце як лісцева-дэкаратыўныя.

Адна-, шматгадовыя травяністыя або паўкустовыя расліны. Лісце прадаўгавата-авальнае, цэласнае, рознага колеру — ружова-бурае, цёмна-фіялетавае, жоўта-зялёнае, на сонцы набывае асабліва яркую афарбоўку. Кветкі дробныя, непрыкметныя, у коласападобных або галоўчатых суквеццях. Размнажаюцца чаранкамі. Выкарыстоўваюцца ў дэкар. садоўніцтве.

**АЛЬТЭРНАРЫЁЗЫ**, інфекцыйныя хваробы раслін, якія выклікаюцца грыбамі з роду *альтэрнарыя*. Крыніца інфекцыі — заражаныя насенне, расліны і пасляўборачныя рэшткі. А. рэзка зніжаюць ураджайнасць, усходжасць насення, захаванасць пладоў. На Беларусі найб. шкаданосны А. капусты — чорная плямістасць. Пашкоджвае ўсе наземныя ч. расліны, асабліва насеннікі, лісце і струкі якіх пакрываюцца цёмным напыленнем. Насенне робіцца шчуплае або зморшчваецца і засыхае. На лісці качаноў утвараюцца цёмныя плямы, тканкі якіх паступова адміраюць. Пашырэнню хваробы спрыяе вільготнае надвор'е. А. моркві — чорная гніль, пашкоджвае расліны ў час росту і пры захоўванні, асабліва страты наносіць насеннікам. На ўсходах хвароба праяўляецца ў выглядзе чорнай ножкі, пазней лісце жаўцее, вяне і засыхае. У сховішчах морква чарнее і гніе. А. бульбы і памідораў выяўляецца на лісці, сцяблах, чаранках, пладах. А. вядомы таксама на збожжа-

вых, бабовых культурах, яблыні, грушы, агрэсце, табацы. Меры барацьбы: правільныя севазвароты, пратручванне насення, знішчэнне раслінных рэшткаў і інш.

**АЛЬТЭРНА́РЫЯ** (Alternaria), род недасканалых грыбоў сям. дэмацыевых. Больш за 100 відаў. Пашырана па ўсім зямным шары. На Беларусі больш за 10 відаў: паслёнавая (A. solani), капусная (A. brassicae), агурковая (A. cucumerina), парэю (A. porri), каранёвая (A. radicina), чаргаваная (A. tenuis) і інш. Сапратрофы. Узбуджальнікі *альтэрнарыёзаў* с.-г. раслін. Выклікаюць сухую і мокрую гніль пладоў і агародніны ў час вегетацыі і асабліва пры захоўванні, мікозы чалавека і жывёл.

Міцэлій шматклетачны, гаплоідны, развіваецца ў тканках або паверхневы, бясколерны, з узростам набывае аліўкавы ці аліўкава-буры колер. Размнажаецца канідыямі. Канідыяльны напыл аксамітны, кропкавы, аліўкавы або чорны. А. зімуюць міцэліем у глебе, на раслінных рэштках.

**АЛЬТЭРНАТЫ́ВА** (франц. alternative ад лац. alter адзін з двух), неабходнасць выбару аднаго з двух або некалькіх рашэнняў (магчымасцяў), якія ўзаемавыключаюць адно аднаго. Кожную з гэтых магчымасцяў часам называюць А.

**АЛЬТЭРНАТЫЎНАЯ СЛУ́ЖБА**, асобны від працоўнай дзейнасці, якім замяняецца *тэрміновая ваенная служба*. А.с. датычыцца грамадзян, што прыгодныя да ваен. службы ва ўзбр. сілах, але па сваіх рэліг., пацыфісцкіх перакананнях або інш. прычынах не могуць прымяняць зброю і баявую тэхніку і адмаўляюцца ад ваен. службы. Грамадзяне, якія знаходзяцца на А.с., працуюць санітарамі, даглядаюць састарэлых і інш. А.с. існуе ў многіх краінах (напр., Бельгіі, Галандыі, Германіі, Францыі і інш.).

Альтэрнарыёзы: 1 — расліны; 2 — струка і насення; 3 — морквы.

Альтэрнарыя паслёнавая: 1 — канідыяносец; 2 — пашкоджаны ліст; 3 — пашкоджаны клубень бульбы.

**АЛЬТЭРНАТЫЎНЫЯ ШКО́ЛЫ**, свабодныя школы, няпоўныя і поўныя сярэднія школы ў краінах Зах. Еўропы і ЗША, якія існуюць паралельна ці замест звычайных школ і забяспечваюць альтэрнатыўную адукацыю па змесце або формах і метадах работы з вучнямі. Узніклі ў канцы 1960-х г. як вынік антыаўтарытарных пед. рухаў. Найбольш пашыраны ў ЗША. Мэта А.ш. — індывідуалізацыя і дыферэнцыяцыя выкладання элекгыўных прадметаў і курсаў навучання.

**АЛЬТЭРНА́ЦЫЯ** (лац. alternatio), тое, што *чаргаванне гукаў*.

**А́ЛЬФА**, назва першай літары грэч. алфавіта α. Паходзіць ад назвы фінікійскай літары 𐤀 («алеф»), што ўзнікла на аснове іерагліфічнага егіп. малюнка галавы быка. У класічным грэч. і візант. пісьме абазначала кароткі і доўгі гук «а», мела лічбавае значэнне 1. З'явілася асновай для кірыліцкай а («аз»). У бел. і інш. мовах слова «альфа» абазначае пачатак чаго-небудзь («альфа і амега» — пачатак і канец, усё галоўнае).

*А.М.Булыка.*

**«А́ЛЬФА РАМЭ́О»** (Alfa Romeo), назва легкавых аўтамабіляў аднайменнай італьян. фірмы. Выпускаюцца з 1930. З 1986 фірма выпускала аўтамабілі малога і сярэдняга класаў з павышанымі дынамічнымі якасцямі. Рабочы аб'ём рухавікоў 1,2—2,5 л, магутнасць 46—118 кВт, макс. скорасць 150—210 км/гадз.

**АЛЬФАНСІ́Н** (Alfonsin) Рауль Рыкарда (н. 13.3.1926, г. Часкамус, Аргенціна), дзярж. і паліт. дзеяч Аргенціны. Скончыў Нац. ун-т у г. Ла-Плата (1950). Адвакат, д-р права. З 1945 чл. Грамадз. радыкальнага саюза (ГРС). У 1958—62 дэп. заканад. сходу правінцыі Буэнас-Айрэс, у 1963—66 і 1973—76 дэп. Нац. кангрэса. У перыяд праўлення ваенных (1966—73 і 1976—83) у апазіцыі. З 1983 старшыня Нац. к-та ГРС. У 1983—89 прэзідэнт Аргенціны. Аўтар кніг па паліт. і сац.-эканам. праблемах. Ганаровы д-р шэрагу замежных ун-таў.

**АЛЬФА́РА** (Alfaro) Элой (1842 — студз. 1912), дзярж. і паліт. дзеяч Эквадора. Лідэр Ліберальна-радыкальнай партыі. Генерал. У 1895 абвешчаны Нар. асамблеяй вярх. правіцелем краіны. У 1897—1901, 1906—11 прэзідэнт Эквадора. У 1906 урад А. прыняў канстытуцыю, якая замацавала дэмакр. свабоды. У 1909 пры падтрымцы А. скліканы 1-ы кангрэс працоўных Эквадора. Забіты ў г. Кіта.

**А́ЛЬФА-РАСПА́Д**, α-распад, самаадвольны радыеактыўны распад атамных ядраў, пры якім адбываецца выпрамяненне *альфа-часціц* (гл. *Радыеактыўнасць*). Найменш пранікальны від выпрамянення, што выпускаецца ра-

дыеактыўнымі рэчывамі. Тэорыя А.-р. (Г.Гамаў, ЗША, 1927) заснавана на квантава-мех. апісанні руху α-часціцы ў патэнцыяльнай яме з бар'ерамі: пакалькі энергія α-часціц складае 5—10 МэВ, а вышыня кулонаўскага бар'ера ў цяжкіх ядрах 25—30 МэВ, то вылет α-часціцы з ядра можа адбывацца толькі за кошт *тунэльнага эфекту*. Вядома больш за 300 α-актыўных ядраў, большасць з якіх штучныя. А.-р. характэрны ў асноўным для цяжкіх ядраў з масавым лікам A>200 і ат. нумарам Z>82. Час жыцця α-радыеактыўных ядраў ад $3\cdot10^{-7}$ с (для $^{212}$Po) да $10^{17}$ гадоў (для $^{204}$Pb).

**АЛЬФАРТЫЁЗ** коней, гельмінтозная хвароба жарабят і дарослых коней, якая выклікаецца нематодай Alfortia edentatus. Пашыраны ўсюды. Паразіты пашкоджваюць тоўсты кішэчнік і выклікаюць запаленне брушыны. Хвароба працякае востра і хранічна. Вострае цячэнне (прыгнечанне, адмова ад корму, анемія, павышэнне т-ры цела) звычайна бывае ў жарабят, многія з захварэлых гінуць. Хранічнае цячэнне (2—3 месяцы) часцей у дарослых коней. Лячэнне тэрапеўтычнае.

**А́ЛЬФА-СПЕКТРО́МЕТР**, прылада для вымярэння энергетычнага размеркавання *альфа-часціц*. У магнітным А.-с. α-часціцы праходзяць у вакууме праз магн. поле, перпендыкулярнае напрамку іх руху, адхіляюцца на розныя вуглы ў залежнасці ад іх энергіі і збіраюцца ў розных месцах калектара. Маюць высокую раздзяляльную здольнасць і малую святласілу; выкарыстоўваюцца для даследавання ядраў з перыядам паўраспаду $T_{1/2} < 10^3 \div 10^6$ гадоў. Іанізацыйны А.-с. — *іанізацыйная камера*; выкарыстоўваецца для даследавання ядраў з $T_{1/2} < 10^6$ гадоў і ядраў новых элементаў.

**А́ЛЬФА-ЧАСЦІ́ЦА**, α-часціца, ядро атама гелію $^4_2$He. Выпрамяняецца некаторымі радыеактыўнымі ядрамі (нуклідамі) і складаецца з 2 пратонаў і 2 нейтронаў, звязаных *ядзернымі сіламі*. Зарад А.-ч. +2, маса $6{,}644\cdot10^{-27}$ кг, магн. момант і спін роўныя 0. Метады назірання А.-ч. заснаваны на *іанізацыі*.

**АЛЬФВЕ́Н** (Alfvén), Альвен Ханес (н. 30.5.1908, г. Норчэпінг, Швецыя), шведскі фізік і астрафізік. Чл. Шведскай АН (1947), замежны чл. АН СССР (1958). Скончыў ун-т Упсалы (1934). З 1937 у Нобелеўскім ін-це фізікі, з 1940 праф. Каралеўскага тэхнал. ін-та (Стакгольм). Навук. працы па электрадынаміцы, фізіцы плазмы, касм. фізіцы і астрафізіцы. Развіў тэорыю ўзнікнення палярных ззянняў, геамагн. бур і Сонечнай сістэмы. Нобелеўская прэмія 1970.

**АЛЬФ'Е́РЫ** (Alfieri) Віторыо (16.1.1749, г. Асты, Італія — 8.10.1803), італьянскі драматург і паэт; стваральнік нац. трагедыі класіцызму. Скончыў Турынскую ваен. акадэмію (1766). Аўтар трагедый: «любоўных» («Антоній і Клеапатра», 1774—75; «Піліп», 1776; «Актавія», 1779, і інш.), «свабоды» («Віргінія», 1777; «Змова Пацы», 1777—81; «Брут I», «Брут II», абедзве 1786, і інш.), «пра барацьбу за трон» («Дон Гарсія», 1774—78; «Марыя Сцюарт», 1777—86, і інш.), «сямейных пачуццяў» («Антыгона», 1775—76; «Альцэста», 1797, і інш.), «унутранай барацьбы» («Саул», 1782); «Міра», 1784); камедый у вершах (1800—03): «Адзіны», «Нямногія», «Процідздзе», «Развод» і інш.; эпіграм, сатыр, празаічных памфлетаў (зб. «Ненавіснік Галаў», 1799); трактатаў «Пра тыранію», «Пра ўладара і літаратуру» (абодва 1789); аўтабіяграфіі «Жыццё Віторыо Альф'еры з Асты, расказанае ім самім» (1806). Яму належаць каля 200 санетаў і пераклады з антычных класікаў.

**АЛЬФЁЛЬДСКІ РУХ**, нац.-дэмакратычны рух збяднелай інтэлігенцыі, малазямельных і беззямельных сялян у

Аўтамабіль «Альфа Рамэо».

паўд.-ўсх. Венгрыі (Альфёльдзе) супраць пагаднення 1867 пра стварэнне аўстра-венг. дзяржавы. Праходзіў пад лозунгамі свабоды, раўнапраўя, аднаўлення канстытуцыі 1848. Пачаўся са стварэння па ініцыятыве адваката Я.Асталаша дэмакр. гурткоў. Сяляне выступалі за падзел лугоў і пашаў, адмену падаткаў; мелі месца ўзбр. сутыкненні з войскамі. А.р. задушаны аўстра-венг. урадам у 1868.

**АЛЬФО́ЛЬ**, алюмініевая фольга, тонкі (0,005—0,2 мм) лісты ці рулоны алюміній. Выкарыстоўваецца пры вытв-сці кандэнсатараў, для цепла-, гідра- і гукаізаляцыі, як упаковачны матэрыял. Гл. таксама *Фольга*.

**АЛЬФО́НС I**, Афонсу (Affonso) Заваёўнік (1107 ці 1111, Гімарайнш, акруга Брага — 6.11 ці 9.12.1185), першы кароль Партугаліі [1139—85]. З Бургундскай дынастыі. У 1112 атрымаў у спадчыну леннае ўладанне бацькі Генрыха Бургундскага — графства Партугалія, якім да 1128 кіраваў пад апекай маці. Пасля перамогі (1139) над маўрамі каля Арыкі прыняў тытул караля. У 1143, абвясціўшы сябе



В.Альф'еры.

папскім васалам, пазбавіўся вярх. улады сюзерэна — караля Кастыліі і Леона. Адваяваў у маўраў Лісабон (1147), заснаваў рыцарскія ордэны Ала і Авіс (гл. *Авіскі ордэн*).

**АЛЬФО́НС V**, Афонсу (Affonso) Афрыканскі (15.1.1432, г. Сінтра — 28.8.1481), кароль Партугаліі [1438—81]. З *Авіскай дынастыі*. Да 1448 правіў пад рэгенцтвам маці Леаноры дэ Арагон. За захоп у 1458—71 шэрагу паўн.-афр. тэрыторый (Алькасар, Касабланка, Арсіла, Танжэр) атрымаў мянушку Афрыканскі. У 1474—79 беспаспяхова змагаўся за кастыльскі прастол. Працягваў даследчыя экспедыцыі свайго дзядзькі Генрыха Мараплаўца ў Афрыку.

**АЛЬФО́НС XII** (Alfonso; 28.11.1857, Мадрыд — 25.11.1885), кароль Іспаніі [1874—85]. З дынастыі *Бурбонаў*. У час рэвалюцыі 1868—74 выхоўваўся ў Вене і Сандхерсце (Англія). Каралём абвешчаны пасля дзярж. пераваротy супраць рэспублікі ген. Мартынеса Кампаса (28.12.1874). У 1876 спыніў *карлісцкія войны*. За клопат пра ўнутр. мір атрымаў мянушку «міратворац».

**АЛЬФО́НС XIII** (Alfonso; 17.5.1886, Мадрыд — 28.2.1941), кароль Іспаніі [1886—1941]. З дынастыі *Бурбонаў*. Сын *Альфонса XII*. Да 1902 правіў пры рэгенцтве сваёй маці Марыі Крысціны Аўстрыйскай. У 1-ю сусв. вайну захоўваў нейтралітэт краіны. Пасля перамогі на выбарах рэспубліканцаў эмігрыраваў (крас. 1931). У 1936 падтрымаў паўстанне нацыянал-фаш. сіл супраць рэспублікі. Адрокся ад прастола на карысць свайго сына Хуана.

**АЛЬФО́НСЫ** (Alfonso), правіцелі ў іспанскіх сярэдневяковых каралеўствах.

Альфонс I Ваяўнік (1084 ? — 8.9.1134), кароль Арагона і Навары [1104—

Схема руху альфа-часціц з рознай энергіяй у магнітным **альфа-спектрометры** (магнітнае поле перпендыкулярнае плоскасці чарцяжа).

34]. Адваяваў у маўраў Сарагосу і зрабіў яе сталіцай (1118).

Альфонс II Нявінны (1132, г. Барселона — 25.4.1196), кароль Арагона [1162—96]. Змагаўся з маўрамі, адваяваў Праванс, у 1179 атрымаў у спадчыну Русільён.

Альфонс III Вялікі (838—20.12.912), кароль Астурыі [866—910]. Адваяваў у маўраў шэраг раёнаў на Пн ад р. Таха. У выніку барацьбы з феад. арыстакратыяй

К.Альхімовіч. Аўтапартрэт. 1864.

якую ўзначалілі яго сыны, быў вымушаны адрачыся ад прастола. Яго сын Гарсія заснаваў дынастыю каралёў Леона.

Альфонс V Велікадушны (1396, г. Медына-дэль-Кампа — 27.6.1458), кароль Арагона [1416—58]. У 1442 заваяваў Неапалітанскае каралеўства, у якім (разам з Сіцыліяй) правіў пад імем Альфонса I [1442—58]. Заснаваў першую ў Італіі гуманістычную акадэмію.

Альфонс VI Храбры (1030—30.6.1109), кароль Леона [1065—1109] і Кастыліі (з 1072). Пасля перамогі ў братазабойчых войнах за панаванне ў хрысц. Іспаніі ў 1077 аб'явіў сябе імп. імператарам. Адваяваў у маўраў Таледа (1085), Валенсію, Альмерыю. Пасля паражэнняў ад *Альмаравідаў* каля Салакі (1086) і Уклеса (1108) страціў шэраг адваяваных раней зямель.

Альфонс VII (1104 ці 1105, Галісія — 21.8.1157), кароль Кастыліі і Леона [1126—57]. Унук Альфонса VI. Імкнуўся да аб'яднання дзяржаў хрысц. Іспаніі; устанавіў свой сюзерэнітэт над Арагонам, Наварай, Партугаліяй і шэрагам франц. тэрыторый. У 1135 на картэсах у Леоне абвешчаны імператарам Іспаніі. Паспяхова ўдзельнічаў у Рэканкісце (паходы ў Андалусію, Эстрэмадуру, на Кордава). У 1150-я г. ваяваў з *Альмахадамі*.

Альфонс VIII (11.11.1155, г. Сорыя — 6.10.1214), кароль Кастыліі [1158—1214]. У 1212 у саюзе з каралямі Навары, Арагона і з дапамогай еўрап. рыцарскага войска дабіўся вырашальнай перамогі над маўрамі пры Лас-Навас-дэ-Талоса (каля г. Хаэн).

Альфонс IX (1171, г. Самора — 24.9.1230), кароль Леона і Астурыі [1188—1230]. У 1188 упершыню склікаў картэсы Леона з удзелам прадстаўнікоў 3-га саслоўя. Адваяваў у маўраў Бадахос (1227), Касерэс і Мерыду (1229).

Альфонс X Мудры (23 ці 26.11.1221, г. Таледа — 4.4.1284), кароль Кастыліі і Леона [1252—84]. Адваяваў у маўраў Херэс (1255), Кадыс (1262) і інш. гарады. Дамагаўся свайго абрання імператарам Свяшчэннай Рымскай імперыі. Яго палітыку цэнтралізацыі не прыняла знаць. У 1282 ён фактычна адхілены ад улады і правіць стаў яго сын Санча. А. X быў паэтам, дбаў пра навукі, у т.л. пра астраномію.

Альфонс XI (27.9.1311, г. Саламанка — 26.3.1350), кароль Кастыліі і Леона [1312—50]. Самастойна правіў з 1325. Атрымаў перамогу над маўрамі пры р. Рыо-Салада (1340). Праводзіў палітыку цэнтралізацыі. У 1348 выдаў статут, які фіксаваў асабістую свабоду сялян.

**АЛЬФРЭ́Д ВЯЛІ́КІ** (Alfred the Great; каля 849 — 26.10.899), кароль *Уэсекса* [871—899]. Аб'яднаў пад сваёй уладай суседнія англасаксонскія каралеўствы. Стварыў флот, пабудаваў крэпасці. У выніку ўпартай барацьбы з датчанамі каля 886 авалодаў паўд.-зах. ч. Англіі. Спрыяў развіццю адукацыі, навукі і л-ры. Аўтар геагр. апісанняў Паўн. Еўропы і перакладаў на стараж.-англ. мову твораў лац. аўтараў. Пры ім складзены 1-ы агульнаангл. збор законаў і частка «Англасаксонскай хронікі».

**АЛЬФРЭ́СКА**, а ф р э с к а (італьян. al fresco па свежым, па сырым), тэхніка насценнага жывапісу, гл. ў арт. *Фрэска*.

**АЛЬХІМО́ВІЧ** Віктар Міхайлавіч (н. 28.8.1941, г. Заслаўе Мінскага р-на),

К.Альхімовіч. Вясковая дзяўчына. 1880-я г.

бел. вучоны ў галіне кардыялогіі. Д-р мед. н. (1989). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1970). З 1977 у Бел.НДІ кардыялогіі. Навук. працы па тэсціраванні сардэчна-сасудзістай сістэмы і спосабах аднаўленчага лячэння сардэчна-сасудзістых хвароб.

*Тв.:* Реография: Импедансная плетизмография. Мн., 1978 (у сааўт.); Инструментальные методы исследования в кардиологии: Руководство. Мн., 1994 (у сааўт.).

**АЛЬХІМО́ВІЧ** Казімір (20.12.1840, в. Дэмбрава Шчучынскага р-на Гродзенскай вобл. — 31.12.1916), жывапісец і графік; прадстаўнік позняга рамантызму і рэалізму ў бел. жывапісе 19 — пач. 20 ст. Вучыўся ў Варшаве ў маст. школе В.Герсана (1871—73), у Парыжы (1876—78), скончыў Мюнхенскую АМ (1875). За ўдзел у паўстанні 1863—64 сасланы ў Сібір (да 1869). З 1878 у Варшаве, удзельнічаў у выстаўках Варшаўскага т-ва заахвочвання мастацтваў і Салона ў Парыжы. Аўтар гіст. палотнаў: «Пахаванне Гедзіміна», «Пасля бітвы», «Смерць Маргера», «Ліздзейка з дачкой на руінах царквы Перуна», «Абарона Ольштына» (1883), «Смерць Глінскага ў турме» (каля 1884). У карцінах «Жніво» (1869), «Вясковая дзяўчынка» (1880-я г.), «Наём работнікаў» (1893), «Парабкава хата», «У поце чала», «Шляхціц і селянін» (1898) і інш. адлюстраваў быт, пакутлівы лёс сялян і парабкаў. Пад уплывам ссылкі напісаў творы «Смерць у выгнанні», «Пахаванне на Урале» (каля 1820), «На этапе» (1894) і інш. Па матывах творчасці А. Міцкевіча стварыў серыю карцін і 12 кардонаў-ілюстрацый да яго паэмы «Пан Тадэвуш». Ілюстраваў творы Ю.Славацкага і Ю.Крашэўскага. Размалёўваў (з Т.Попелем і А.Пятроўскім) касцёл Св. Кацярыны ў Пецярбургу.

**АЛЬХО́ВІКАЎ** Мікалай Леанідавіч (7.9.1922, г. Таганрог — 8.6.1987), рус. артыст цырка. Нар. арт. СССР (1980). У цырку з 1929. Выступаў пад псеўд. Ніка. У 1950—53 вучыўся на вакальным аддз. Маскоўскай кансерваторыі. Скакун на падкідных дошках, эквілібрыст на пераходнай лесвіцы, жакей, конны акрабат. Стваральнік і ўдзельнік конна-акрабатычнага атракцыёна «Руская тройка» (1971).

**АЛЬХО́ВЫЯ ЛЯСЫ́**, а л е ш н і к і, драбналістыя лясы, аснову дрэвастою якіх складаюць віды з роду *вольха*. Пашыраны ва ўмеранай паласе паўн. паўшар'я, асн. масівы ў Паўн. Амерыцы, пераважна вольха чырвоная (A. rubra), Усх. Азіі — вольха пушыстая (A. hirsuta) і інш., гарах Цэнтр. Еўропы. На Беларусі пашыраны чорнаалешнікі, лясы з вольхі чорнай, або клейкай (A. glutinosa), і шэраалешнікі — вольхі шэрай (A. incana); агульная пл. 623,4 тыс. га; з іх чорнаалешнікаў 551,7, шэраалешнікаў 71,7 тыс. га (1994).

Чорнаалешнікі належаць да карэнных занальна абумоўленых лясоў Беларусі. Найб. пашыраны асакова-травяныя чорнаалешнікі — тыповыя фітацэнозы лясных нізінных балот (займаюць пераўвільготненыя экатопы з багатай глебай). Шэраалешнікі належаць да другасных (вытворных) драбналістых лясоў, што ўзнікаюць на месцы высечаных шыракаліста-яловых або на с.-г. землях, якія не выкарыстоўваюцца. Найб. пашыраны кіслічны і снітkавы тыпы шэраалешнікаў (займаюць пераважна ўрадлівыя свежыя і ўвільготненыя дзярнова-падзолістыя сугліністыя і супясчаныя глебы). Паўд. мяжа шэраалешнікаў праходзіць уздоўж паўд. адгор'яў Бел. градаў.

*Г.У.Вынаеў.*

**АЛЬХО́Н**, востраў у паўн.-зах. частцы воз. Байкал, у Расійскай Федэрацыі. Ад берага аддзелены пралівамі Малое Мора і Альхонскія Вароты. Пл. каля 730 км². Выш. да 1276 м. Складзены з гнейсаў, мармураў, гранітаў і кварцытаў. На Пн в-ва лісцевая тайга, на Пд—

стэп. Характэрны паўн.-зах. вятры вял. сілы (сарма). На А. — пас. Хужыр.

**АЛЬХО́ЎСКАЕ ВАДАСХО́ВІШЧА**, у Беларусі, у Астравецкім р-не Гродзенскай вобл. На р. Страча, за 26 км на ПнУ ад г.п. Астравец. Створана ў 1951 для водазабеспячэння кардоннай ф-кі «Альхоўка». Пл. 0,7 км$^2$. Даўж. 3,7 км, найб. шыр. 0,28 км, найб. глыб. 5,2 м, аб'ём вады 2,1 млн. м$^3$. Пл. вадазбору 1140 км$^2$. Берагі абрывістыя (мясцінамі вышынёй да 7 м), парослыя лесам.

**АЛЬХО́ЎСКІ** Мікалай Іванавіч (10.10.1909, в. Межава Аршанскага р-на Віцебскай вобл. — 26.8.1978), Герой Сав. Саюза (1944). Скончыў Ваенна-паветр. акадэмію (1936). З лют. 1943 на Бранскім, Варонежскім, Сцяпным, 2-м Укр. франтах, удзельнік Курскай бітвы, вызвалення Украіны, Малдовы, Румыніі, Венгрыі, Чэхіі, Славакіі. Камандзір эскадрыллі знішчальнага авіяпалка, маёр, зрабіў 128 баявых вылетаў, знішчыў 19 самалётаў праціўніка. Да 1953 у Сав. Арміі.

**АЛЬХО́ЎЦЫ**, вёска ў Беларусі, у Ляхавіцкім р-не Брэсцкай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Альхоўскі». За 10 км на ПдЗ ад Ляхавічаў, 235 км ад Брэста, 7 км ад чыг. ст. Ляхавічы. 504 ж., 187 двароў (1995). Сярэдняя школа, Дом культуры, 2 б-кі, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі.

**АЛЬЦЫЁНА**, η Цяльца, зорка 3-й *зорнай велічыні* (2,9 візуальнай зорнай велічыні). Найб. яркая ў зорным скопішчы Плеяд. Адлегласць ад Сонца 59 пс.

**АЛЬША́НІКІ**, вёска ў Беларусі, у Круглянскім с/с Круглянскага р-на Магілёўскай вобл. Цэнтр калгаса імя Дзімітрава. За 4 км на ПдУ ад г.п. Круглае, 45 км ад Магілёва, 3 км ад шашы Круглае—Магілёў. 183 ж., 63 двары (1995). Базавая школа, б-ка, клуб.

**АЛЬША́НІЦКАЯ БІ́ТВА 1527**. Адбылася паміж войскамі ВКЛ і крымскіх татараў каля р. Альшаніца (прыток Дняпра), за 30 км на ПдУ ад Кіева 27 студз. Са снеж. 1526 татары шматлікімі набегамі на польскія, паўд.-бел. і літ. землі прычынялі вял. страты. 7 тыс. коннікаў ВКЛ на чале з вял. гетманам К.Астрожскім і палявым гетманам Я.Радзівілам, а таксама войскі князёў Юрыя Сямёнавіча Слуцкага, Андрэя Неміровіча, Івана і Аляксандра Вішнявецкіх і інш. дагналі татараў (24 тыс. чал. на чале з царэвічам Малаем) на р. Альшаніца, разбілі іх і вызвалілі 80 тыс. палонных, вярнулі нарабаваную маёмасць, Малай узяты ў палон, а потым забіты. Крымскае ханства спыніла значныя набегі на землі ВКЛ.

**АЛЬША́НКА**, рака ў Беларусі, гл. *Усвейка*.

**АЛЬША́НКА**, Вішнёўка, Гальшанка, Жыгянка, Луска, рака на З Беларусі, у Мінскай і Гродзенскай абл., правы прыток Бярэзіны (бас. Нёмана). Даўж. 60 км. Пл. вадазбору 311 км$^2$. Цячэ на паўд.-зах. схілах Ашмянскага ўзв. (Ашмянскі р-н Гродзенскай вобл.). Даліна выразная. Пойма двухбаковая, шыр. 100—200 м. Рэчышча сярэднязвілістае, месцамі каналізаванае. Берагі нізкія.

**АЛЬША́НКА**, возера ў Беларусі, у Сенненскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Бярозка (прыток Зах. Дзвіны). Пл. 0,4 км$^2$. Даўж. 1,68 км, найб. шыр. 0,31 км, найб. глыб. 11,1 м. Пл. вадазбору 9,2 км$^2$. Схілы выш. 2—5 м. Берагі нізкія, месцамі забалочаныя. Дно пераважна пясчанае. Злучана пратокай з воз. Абразцы.

**АЛЬША́НСКАЕ ВО́ЗЕРА**, у Беларусі, у Шумілінскім р-не Віцебскай вобл., у бас. Зах. Дзвіны. Пл. 0,2 км$^2$. Даўж. 0,6 км, найб. шыр. 0,4 км. Пл. вадазбору 11,4 км$^2$. Схілы разараныя. Пойма з З і ПдЗ забалочаная. Сцёк праз ручай у Зах. Дзвіну.

Да арт. **Альховыя лясы**. Шэраалешнік кіслічны.

## АЛЬШЭЎСКІ 289

**АЛЬША́НЫ**, вёска ў Столінскім р-не Брэсцкай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 44 км на ПнУ ад Століна. 286 км ад Брэста, 51 км ад чыг. ст. Гарынь. 588б ж., 2007 двароў (1994). Сярэдняя школа, Дом культуры, 3 б-кі, амбулаторыя, аддз. сувязі, Дом быту. Малітоўны дом. Царква — помнік драўлянага

А.А.Альшэўскі.

дойлідства 1866. Каля А. магіла ахвяр фашызму.

**АЛЬШО́ЎКА**, рака на У Беларусі, у Хоцімскім р-не Магілёўскай вобл. і Расіі (Смаленская вобл.), левы прыток Беседзі (бас. Дняпра). Даўж. 28 км (у межах Беларусі каля 14 км). Пл. вадазбору 164 км$^2$. Пры ўпадзенні ў Беседзь г.п. Хоцімск.

**АЛЬШТЫ́НСКАЕ ВАЯВО́ДСТВА** (Województwo Olsztyńskie), на Пн Польшчы. Пл. 12,3 тыс. км$^2$, нас. 738,6 тыс. чал., гарадскога 58% (1987). Адм. цэнтр — г. *Ольштын*. Найб. гарады: Ольштын, Кентшын, Ілава, Шчытна, Аструда. Большую частку А.в. займаюць Мазурскае і Ілаўскае паазер'і, на Пн — Старапруская нізіна. У сярэдняй і паўд.-зах. частках марэнныя ўзвышшы (да 312 м над узр. м.). Клімат умераны, марскі. Сярэдняя т-ра студз. -3,5 °С, ліп. 17,5 °С, ападкаў 550 мм за год. Шматлікія рэкі бас. Віслы і Прэголі, найб. азёры — Язёрак, Нара, Ланскае і інш. Глебы дзярнова-падзолістыя. Вядучая галіна эканомікі — сельская гаспадарка. Вырошчваюць кармавыя культуры, жыта, ячмень, авёс, бульбу; гадуюць свіней і буйн. раг. жывёлу, пераважна малочнага кірунку. Прам-сць: маш.-буд., лёгкая, хім., дрэваапр., харчовая. Турызм (азёры, поле Грунвальдскай бітвы 1410).

**АЛЬШЭ́ВА**, вёска ў Беларусі, у Свірскім пасялковым савеце Мядзельскага р-на Мінскай вобл. За 58 км на ПнЗ ад Мядзела, 198 км ад Мінска, 15 км ад чыг. ст. Лынтупы. 55 ж., 29 двароў (1995). На левым беразе р. Страча — рэшткі сядзібы 1887—93 і пейзажны парк.

**АЛЬШЭ́ЎСКІ** Анатоль Адамавіч (парт. псеўд. Юрка Пружанскі; 4.7.1904, г. Бяроза — 1937), дзеяч рэв. руху ў Зах. Беларусі, публіцыст. З 1920

вучыўся ў Камуніст. ун-це імя Свярдлова (Масква). З 1925 на падп. рабоце ў Зах. Беларусі. На III канфер. (1926) і I з'ездзе (1928) КПЗБ выбраны чл. ЦК. Рэдактар друк. органаў ЦК КПЗБ *«Бальшавік»* і *«Чырвоны сцяг»*. У 1927 арыштаваны польск. ўладамі і знявольлены, з 1928 у СССР. З 1932 у рэдакцыі Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ пры ЦК КП(б)Б у Мінску, на прафс. рабоце. У публіцыст. артыкулах, апублікаваных пад псеўданімамі і ананімна ў падп. выданнях, выкрываў палітыку ўрада Польшчы. У 1937 незаконна рэпрэсіраваны. Рэабілітаваны пасмяротна. *У.А.Калеснік.*

**АЛЬШЭЎСКІ** (Olszewski) Кароль Станіслаў (29.1.1846, Бранішаў Тарноўскі, Польшча — 24.3.1915), польскі фізік і хімік. Чл. Кракаўскай АН (1888). Скончыў Гейдэльбергскі ун-т (1872). З 1876 праф. Кракаўскага ун-та. У 1883 разам з З.Ф.Урублеўскім упершыню атрымаў вадкі кісларод, у 1895 — вадкі аргон. Адыябатычным расшырэннем сціснутага і ахалоджанага вадароду дабіўся яго звадкавання. У 1896—1905 спрабаваў атрымаць вадкі гелій і дасягнуў пры гэтым т-ры парадку некалькіх кельвінаў. Даследаваў фіз. ўласцівасці кандэнсаваных газаў (метану, цвёрдага азоту і інш.).

**АЛЬШЭЎСКІ ЛЕ́ТАПІС**, помнік беларуска-літоўскага летапісання 16 ст.; спіс пашыранай рэдакцыі *«Хронікі Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага»*, перакладзены на польскую мову, аналагічны тэксту Кракаўскага (на польскай мове) і Румянцаўскага спісаў (гл. *Румянцаўскі летапіс*). У 19 ст. захоўваўся ў б-цы А.Хамінскага ў маёнтку Альшэва (ад яго і назва) каля Нарачы (Мядзельскі р-н). Датуецца 1550.

У А.л. пададзена гісторыя ВКЛ ад легендарнага кн. Палемона да сярэдзіны 15 ст. Найб. падрабязна асветлены перыяд княжання Вітаўта, выкладзены паводле *«Летапісца вялікіх князёў літоўскіх»*. У канцы летапісу змешчана «хронічка» — збор кароткіх датаваных звестак за 1307—1535. А.л. — самы ранні пераклад на польскую мову бел.-літ. летапісу. Зберагаецца ў Нац. б-цы ў Варшаве. Апубл. С.Пташыцкім асобным выданнем (Вільня, 1907) і ў Поўным зборы рус. летапісаў (т. 17, 1907), перавыдадзены М.М.Улашчыкам тамсама (т. 35, 1980). *В.А.Чамярыцкі.*

**АЛЬЯ́НС** (франц. alliance), 1) саюз, аб'яднанне дзяржаў, паліт. партый, фракцый для дасягнення агульнай мэты ў пэўны час. 2) Шлюбны саюз.

**АЛЬЯ́НС ВЫТВО́РЦАЎ КАКА́ВЫ** (Cocoa Producers Alliance; A B K), міжнародная арг-цыя краін — вытворцаў какавы. Чл.-ўдзельнікі: Бразілія, Габон, Гана, Камерун, Кот-д'Івуар, Нігерыя, Сан-Таме і Прынсіпі, Того, Трынідад і Табага, Эквадор. Створана ў 1962. Месца знаходжання — Лагас (Нігерыя). Мэты: спрыянне эканам. і сац. адносінам паміж краінамі — какававытворцамі, абмен навук. і тэхн. інфармацыяй, забеспячэнне эфектыўных паставак какавы па рэнтабельных цэнах, садзейнічанне пашырэнню какаваспажывання.

**АЛЬЯ́НС САЦЫЯЛІСТЫ́ЧНАЙ ДЭМАКРА́ТЫІ**, Міжнародны альянс сацыялістычнай дэмакратыі, анархічная арг-цыя, створаная ў 1868 у Жэневе М.А.*Бакуніным*, Ж.Рэклю, А.Рышарам і інш. У 1869 фармальна распушчаны, але фактычна працягваў дзейнасць у складзе 1-га Інтэрнацыянала як Жэнеўская секцыя (пад назвай А.с.д. — Цэнтр. секцыя). Члены А.с.д. не прызналі выключэння Бакуніна і яго прыхільнікаў з Інтэрнацыянала (1872) і да 1877 працягвалі збіраць уласныя міжнар. кангрэсы.

**АЛЭ́** (Allais) Марыс (н. 1911), французскі вучоны-эканаміст. Скончыў Парыжскую вышэйшую нац. горную школу (1936). Праф. (1944). З 1946 дырэктар Нац. цэнтра навук. даследаванняў, з 1948 праф. Парыжскай вышэйшай нац. горнай школы. Навук. даследаванні па эканам. кіраванні, рэгуляванні даходаў і падаткаабкладанні, грашовай палітыцы, эканоміцы энергетыкі, транспарту і здабыўных галін, тэорыі выбару ва ўмовах рызыкі. Нобелеўская прэмія па эканоміцы 1988 за ўклад у тэорыю рынку і за работы па эфектыўным выкарыстанні рэсурсаў.

**АЛЮ́ВІЙ**, алювіяльныя адклады (ад лац. alluvio нанос, намыў), адклады водных патокаў (рэк, ручаёў), якія намножыліся ў рэчышчах, на поймах і тэрасах рачных далін. Складаюцца з абломкавага матэрыялу рознай велічыні, ступені сартавання і абкатанасці (*галечнік, жвір, пяскі, супескі, суглінкі, гліны*), нярэдка з лінзамі торфу. Утварае поймы (паплавы), алювіяльныя тэрасы ўсіх рэк, *алювіяльныя раўніны*, займае больш за 5% тэр. Беларусі. Звычайна слаісты. Характэрна косая слаістасць, што абумоўлена напрамкамі руху водных патокаў. Вылучаюць рэчышчавую, поймавую і старычную разнавіднасці (фацыі). Фарміраванне А. ў рэчышчы адбываецца ў выніку папярочнага цыркуляцыйнага руху вады, якая падмывае ўвагнуты бераг, наслойваючы сегменты грубага матэрыялу (галечнік, жвір, пяскі) каля выпуклага берага. Поймавы А. адкладваецца пры шырокіх разлівах у поймах рэк і складзены з найб. тонкага пясчана-гліністага матэрыялу. Старычны фарміруецца ў азёрападобных старых рэчышчах і складзены з багатых арган. рэчывамі супескаў, суглінкаў, ілу, торфу. З валунова-галечным А. горных рэк звязаны россыпы золата, плаціны, волава і інш. цяжкіх мінералаў; са жвірова-пясчаным рэчышчавым А. рэк нізкагор'яў і раўнін — радовішчы буд. пяскоў і жвіру. А. — субстрат алювіяльных глебаў (гл. *Поймавыя глебы*).

*М.Я.Зусь.*

**АЛЮВІЯ́ЛЬНЫЯ ГЛЕ́БЫ**, гл. *Поймавыя глебы.*

**АЛЮВІЯ́ЛЬНЫЯ РАЎНІ́НЫ**, нізінныя прасторы, якія ўтварыліся ў выніку акумуляцыйнай дзейнасці вял. рэк на месцы шырокіх і доўгіх паніжэнняў зямной паверхні [напр., Падунская раўніна (Італія), Вял. Кітайская раўніна]. Паверхня А.р. складаецца з шырокіх поймаў, фрагментаў рачных тэрас. На Беларусі найб. паніжаныя месцы (да 130 м над узр. м.) з амаль плоскім рэльефам заняты балотамі і забалочанымі ўчасткамі з пясчанымі дзюнамі (выдмамі). Значныя ч. Бел. Палесся (Гомельскае і Прыпяцкае Палессі) — фрагменты алювіяльных і водна-ледавіковых раўнін, дзе на месцы Прыпяцкага прагіну намножыліся водна-ледавіковыя адклады, *алювій* Дняпра і яго прытокаў.

**АЛЮ́ЗІЯ** (ад лац. allusio жарт, намёк), адна з *стылістычных фігур*, намёк на агульнавядомы паліт., гіст. або літаратурны факт. Напр., П.Панчанка ў радках верша «Паэзія» («Кажуць, непатрэбшчына — // Рыфмы нават геніяў. // А што рабіць з трэшчынай? // Помніце? Гейнэ») апелюе да вобразнага выказвання Г.Гейне, што ўсе трэшчыны свету праходзяць праз сэрца паэта. Злоўжыванне А. можа прывесці да своеасаблівай зашыфраванасці сэнсу твора.

**АЛЮМААРГАНІ́ЧНЫЯ ЗЛУЧЭ́ННІ**, гл. ў арт. *Металаарганічныя злучэнні.*

**АЛЮМАГЕ́ЛЬ**, аморфны высокасітаваты аксід алюмінію $Al_2O_3$. Хутка паглынае вільгаць, не растваральнікаў. Атрымліваецца абязводжваннем гідраксіду алюмінію. Адсарбент для сушкі газаў, ачысткі вады, асвятлення растворaў у цукр. вытв-сці; улоўнік растваральнікаў, каталізатар. А. наз. таксама любы (у т.л. крышталічны) $Al_2O_3$.

**АЛЮМАСІЛІКА́ТЫ**, алюмакрэмніевыя солепадобныя злучэнні з катыёнамі шчолачных металаў, да якіх належыць вял. група пародаўтваральных мінералаў кл. сілікатаў. Прыродныя А. найчасцей маюць каркасную (артаклаз, мікраклін, альбіт) або слаістую (мінералы групы слюдаў) структуру; вядомы А., якія трапляюцца сярод сілікатных мінералаў інш. структурна-хім. тыпаў (стужачнага — рагавая падманка, ланцужковага — аўгіт, астраўнога — кардыярыт). Да А. належаць *плагіяклазы, нефелін, лейцыт* і інш. Пры выветрыванні А. утвараюцца мінералы *глін, гідраслюдаў, баксітаў*. Найб. пашыраныя А. — *палявыя шпаты, слюды, цэаліты, хларыты* і інш. А. штучныя сінтэзуюць метадамі, якія імітуюць прыродныя геахім. працэсы. Практычнае значэнне маюць штучныя А. тыпу цэалітаў (малекулярныя сіты і пермутыты). Малекулярныя сіты атрымліваюць пры t 60—450 °С з раствору алюмінату натрыю і воднай суспензіі крэмніевай кіслаты з дабаўкай шчолачы, пермутыты — спяканнем кааліну, палявога шпату з кварцам і содай

пры t 1000 °С. Штучныя А. выкарыстоўваюцца ў хім. прам-сці: малекулярныя сіты для працэсаў глыбокай асушкі, тонкай ачысткі і раздзялення газаў, у храматаграфічным аналізе газаў і вадкасцяў; пермутыты для змяншэння жорсткасці вады.

**АЛЮМАТО́Л**, грануляванае выбуховае рэчыва брызантнага дзеяння; сплаў *трынітраталуолу* з парашком алюмінію. Выкарыстоўваецца на адкрытых работах для разбурэння абводненых цвёрдых парод.

**АЛЮМЕ́ЛЬ** [ад *алюм* (*іній*) + (*нік*)*ель*], сплаў на аснове нікелю з дамешкамі алюмінію (1,8—2,5%), марганцу (1,8—2,2%) і крэмнію (0,85—2,00%), часам цырконію і кобальту. Магнітны, пластычны, са спалучэннем тэрмаэл. уласцівасцяў і гарачатрываласці. Выкарыстоўваецца ў тэрмапарах (з *хамелем*) для вымярэння т-ры (20—1000 °С).

**АЛЮМІНАВА́ННЕ**, нанясенне на паверхню метал. вырабаў алюмінію ці яго сплаваў. Ахоўвае яе ад карозіі, надае спецыяльныя фіз.-хім. ўласцівасці, паляпшае вонкавы выгляд вырабаў. Ажыццяўляецца *алітаваннем*, газаплазмавым і плазмавым распыленнем, плакіраваннем, выпарэннем металу ў вакууме, апусканнем у расплаў. Выкарыстоўваецца пры апрацоўцы дэталяў самалётаў, ракет, аўтамабіляў, с.-г. інвентару, бытавых вырабаў.

**АЛЮМІНА́ТЫ**, солі няўстойлівых алюмініевых кіслот: ортаалюмініевай $H_3AlO_3$ і метаалюмініевай $HAlO_2$ і інш. А. шчолачных металаў растваральныя ў вадзе, іх водныя растворы няўстойлівыя з-за гідролізу да $Al(OH)_3$; інш. А. цяжка растваральныя ў вадзе. А. двухвалентных металаў і рэдказямельных элементаў хімічна і тэрмічна трывалыя. У прыродзе А. — мінералы: высакародная *шпінель* $Mg[Al_2O_4]$, ганіт (цынкавая шпінель) $Zn[Al_2O_4]$, *хрызаберыл* $Be[Al_2O_4]$. Атрымліваюць А. сплаўленнем ці спяканнем $Al_2O_3$ з аксідамі металаў або награваннем сумесі тэрмічна няўстойлівых соляў. Выкарыстоўваюцца ў папяровай прам-сці, у вытв-сці спец. керамікі, аптычнага шкла, ядз. тэхніцы, пры афарбоўцы тканін, А. кальцыю — у вытв-сці партландцэментаў.

**АЛЮМІНАТЭРМІ́Я** (ад *алюміній* + грэч. thermē цяпло), від *металатэрміі*; тэрмічны працэс, заснаваны на аднаўленні парашкападобным алюмініем кіслародных злучэнняў металаў.

Адбываецца ў плавільнай шахце ці тыгелі, куды засыпаецца парашкападобная шыхта, якая падпальваецца з дапамогай запальнай сумесі. Пры гарэнні развіваецца высокая т-ра (да 3000 °С), цеплата рэакцыі складае не менш за 2300 кДж/кг сумесі. Калі цеплата рэакцыі меншая, то сумесь вокісу металу з алюмініем падагравають у эл. печы (А. электрапечная), калі пры аднаўленні вылучаецца вял. колькасць цяпла (без дадатковага яго падводзення), ажыццяўляецца А. пазапечная. А. выкарыстоўваецца для награвання і расплаўлення кантаў метал. вырабаў, што зварваюцца (напр., пры тэрмічнай зварцы рэек), для запальных сумесяў, у металургіі для атрымання з аксідаў металаў і сплаваў (безвугляродзістых металаў, фераспла-ваў, лігатур).

**АЛЮМІ́НІЕВАЯ ПРАМЫСЛО́ВАСЦЬ**, падгаліна каляровай металургіі, якая ўключае прадпрыемствы па здабычы алюмініевай сыравіны і вытв-сці гліназемy (*алюмінію аксіду*), металічнага алюмінію, крэмнію, алюмініева-крэмніевых сплаваў (сілуніту), фтарыстых соляў і інш. (больш за 200 відаў прадукцыі). Па аб'ёме вытв-сці і выкарыстанні алюміній у сусв. эканоміцы займае 1-е месца сярод каляровых металаў. Алюмініевая сыравіна — *баксіты*, нефелін-апатытавыя і алунітавыя руды, нефелінавыя канцэнтраты і інш. (гл. *Алюмініевыя руды*). Адна з найб. энергаёмістых галін металургіі (на вытв-сць 1 т метал. алюмінію патрэбна каля 18 тыс. кВт·гадз электраэнергіі), таму яе размяшчэнне залежыць ад наяўнасці крыніц таннай электраэнергіі.

Узнікла ў 1886, калі быў адкрыты спосаб

Да арт. **Алюмінатэрмія.** Схема тэрмітнай зваркі рэек: 1 — шлак; 2 — тыгель; 3 — вадкі тэрмітны метал; 4 — зварачная форма.

атрымання алюмінію электролізам гліназемy (ЗША, Францыя). Хуткае развіццё А.п. ў канцы 19 — пач. 20 ст. звязана з вынаходствам гідрахім. спосабу вытв-сці гліназемy з баксітаў і вял. попытам на алюміній, асабліва ў сувязі з ростам авіяцыі. У б. СССР А.п. створана ў 1932—33 на энергет. базе першых буйных гідраэлектрастанцый (Волхаўскі і Дняпроўскі алюм. з-ды; пазней пабудаваны буйныя прадпрыемствы на Урале і ў Сібіры). Хуткі рост А.п. выклікаў павелічэнне здабычы баксітаў у свеце. Пасля 2-й сусв. вайны знойдзены багатыя радовішчы баксітаў у Афрыцы, Паўд. Амерыцы, пазней — у Аўстраліі. Сусв. здабыча баксітаў 92,5 млн. т (1984), найб. — у Аўстраліі і Гвінеі (49% сусв. рэсурсаў), на Ямайцы. Буйнейшыя вытворцы гліназемy — Аўстралія, ЗША, Ямайка. Асн. імпарцёры баксітаў і гліназемy — ЗША, Канада, Японія, Нарвегія. Вытв-сць першаснага алюмінію ( ступень ачысткі 99,7%) у свеце пастаянна расце, складае каля 16 млн. т (1984), сканцэнтравана ў ЗША, краінах б. СССР, Канадзе і інш. Акрамя першаснага вырабляюць значную колькасць алюмінію высокай ачысткі. Буйныя экспарцёры алюмінію — Канада, Нарвегія, імпарцёры — Японія, ЗША, ФРГ. Вытв-сцю алюмінію займаюцца больш за 80 кампаній (1982), 6 з іх вядучыя транснацыянальныя («Алкэн алюмініум», «Алюмінум компані оф Амерыка», «Рэйналдс металс», «Кайзер алюмінум энд кемікал», «Пешынэ», «Свіс алюмініум»), якія кантралююць 60% здабычы баксітаў, 65% вытв-сці гліназемy, 55% вытв-сці алюмінію.

Сучасная А.п. выкарыстоўвае новыя тэхналогіі комплекснай перапрацоўкі нефелін-апатытавых рудаў і нефелінавых канцэнтратаў на гліназём, содапрадукты, цэмент і інш., вядзе пошук новых эканам. тэхналогій атрымання алюмінію з небаксітавых відаў сыравіны. Буйныя запасы такой сыравіны ў ЗША (160 млрд. т), Нарвегіі, Іране, Іспаніі, ФРГ. На Беларусі — багатае радовішча небаксітавай сыравіны — даўсаніту (Заазерскае, паблізу Мазыра) і каалінітавыя гліны.

**АЛЮМІ́НІЕВЫ ГАЛЫ́Н**, комплексныя злучэнні, крышталегідраты двайных соляў тыпу M $[Al(SO_4)_2]\cdot 12H_2O$ (M—K, Na, $NH_4$ і інш.). Бясколерныя крышталі, растваральныя ў вадзе, пры награванні страчваюць крышталізацыйную ваду з утварэннем т.зв. паленага галыну. Найб. ужывальны алюмакаліевы галын; атрымліваюць апрацоўкай баксіту ці гліны гарачай сернай кіслатой з наступным дабаўленнем да раствору сульфату калію. Выкарыстоўваюць пры фарбаванні тканін, дубленні скур, праклейванні паперы, ачыстцы вады, у медыцыне як дэзінфекцыйны і вяжучы сродак.

**АЛЮМІ́НІЕВЫЯ КАНСТРУ́КЦЫІ** будаўнічыя, канструкцыі і вырабы з алюмініевых сплаваў ці тэхн. алюмінію. Лёгкія, трывалыя, даўгавечныя, маюць высокія дэкар. якасці, але складаныя ў выкананні роўнатрывалых злучэнняў, асабліва зварных; патрабуюць уліку зніжанага (прыкладна ў 3 разы ў адносінах да сталі) модуля пругкасці алюм. сплаваў. На выраб А.к. ідуць тонкі ліставы метал і прасаваныя танкасценныя профілі. Выкарыстоўваюцца як канструкцыйныя і аддзелачныя элементы ў будынках, трансп., спарт. і інш. збудаваннях.

**АЛЮМІ́НІЕВЫЯ РУ́ДЫ**, горныя пароды і мінералы, сыравіна для атрымання *алюмінію*. Асноўныя А.р. — *баксіты*, з якіх атрымліваюць паўпрадукт — гліназём ($Al_2O_3$). У якасці А.р. выкарыстоўваюцца таксама нефелінавыя сіеніты, алунітавыя і нефелін-апатытавыя пароды; магчыма выкарыстанне высокакагліназемных каалінітавых глін і аргілітаў, лейцытаў, анартазітаў, лабрадарытаў, даўсанітаў, алюмафасфатаў і інш. А.р. — комплексная сыравіна; з баксітаў атрымліваюць таксама галій, ванадый, скандый, з нефелін-апатытавых парод — адначасова фасфаты. Буйнейшыя радовішчы ў Расіі, Казахстане, Гвінеі, Аўстраліі, Бразіліі, ЗША, Індыі, Камеруне, на Ямайцы і інш. На Беларусі перспектывы на баксітазмяшчальныя руды могуць быць звязаны з верхнімі гарызонтамі дакембрыю і карой выветрывання некаторых гарызонтаў палеазою, з радовішчамі даўсаніту.

**АЛЮМІ́НІЕВЫЯ СПЛА́ВЫ**, сплавы на аснове *алюмінію* з дабаўкамі іншых элементаў (медзі, магнію, цынку, крэмнію, марганцу, літыю, кадмію, цырконію, хрому). Адметныя малой шчыльнасцю (да $3 \cdot 10^3$ кг/м$^3$), высокімі мех. ўласцівасцямі, каразійнай устойлівасцю, высокай цепла- і электраправоднасцю, трывалаасцю і пластычнасцю пры нізкіх т-рах. Лёгка апрацоўваюцца рэзаннем і зварваюцца кантактнай зваркай (некаторыя плаўленнем), на вырабы з іх лёгка наносяцца ахоўныя і дэкар. пакрыцці.

Разнастайнасць уласцівасцяў А.с. звязана з увядзеннем пэўных прысадак, якія ўтвараюць з алюмініем цвёрдыя растворы і інтэрметаліды і з'яўляюцца ўмацавальнай фазай сплаваў. Найб. пашыраны сплавы Al—Cu—Mg (дзюралюміны), Al—Mg (магналіі), Al—Si (*сілуміны*), Al—Mg—Si (*авіялі*), высокатрывалыя Al—Zn—Mg—Cu, крыягенныя і гарачатрывалыя Al—Cu—Mn, сплавы з нізкай шчыльнасцю Al—Mg—Li, Al—Cu—Li, Al—Cu—Mg—Li, парашковыя і грануляваныя. А.с. падзяляюцца на дэфармавальныя, ліцейныя і спечаныя. З дэфармавальных пракатваннем, прасаваннем, коўкай ці штампоўкай, валачэннем атрымліваюць пліты, лісты, профілі, пруткі, накоўкі, дрот. З ліцейных А.с. вырабляюць фасонныя адліўкі метадамі ліцця ў земляныя, коркавыя ці метал. (кокільныя) формы, а таксама ліцця пад ціскам. Спечаныя А.с. атрымліваюць метадамі *парашковай металургіі*. А.с. выкарыстоўваюць у авіяц. прам-сці, судна- і прыладабудаванні, аўтамаб., электратэхн. вытв-сці, буд-ве, у вытв-сці быт. вырабаў.

**АЛЮМІ́НІЙ** (лац. Aluminium), Al, хімічны элемент III групы перыядычнай сістэмы Мендзялеева, ат. н. 13, ат. м. 26,98. Прыродны А. складаецца з аднаго стабільнага ізатопа $^{27}$Al (100%). У літасферы А. складае 8,8% па масе (першае месца сярод металаў). Атрыманы ў 1825 дацкім вучоным Х.К.Эрстэдам. Галоўныя носьбіты А. — *алюмасілікаты*, асн. крыніцы атрымання — *баксіты, алуніты*, нефелін-апатытавыя руды.

Лёгкі серабрыста-белы метал, добра праводзіць цеплыню і электрычнасць, пластычны, шчыльн. 2,7·10$^3$ кг/м$^3$, $t_{пл}$ 660 °С. Хім. актыўны: на паверхні стварае ахоўную аксідную плёнку, аднаўляе металы і неметалы з іх аксідаў, узаемадзейнічае з галагенамі, пры высокіх т-рах з азотам, вугляродам і серай. На А. не дзейнічаюць разбаўленыя і моцныя азотная, саляная і серная к-ты. А. з шчолачамі ўтварае *алюмінаты*. Прамысловы спосаб атрымання заснаваны на электролізе раствору гліназёму ($Al_2O_3$) у расплаўленым крыяліце ($Na_3AlF_6$) пры t 950 °С. Выкарыстоўваецца ў авіяцыі, буд-ве (канструкцыйны матэрыял), электратэхніцы, металургіі (гл. *Алюмінатэрмія*), хім. і харч. прам-сці (тара, упакоўкі), вытв-сці выбуховых рэчываў (*аманал, алюматол*). Як мікраэлемент уваходзіць у склад тканак жывых арганізмаў і раслін; лішак А. шкодны, акумулюецца ў печані, падстраўнікавай і шчытападобнай залозах.

**АЛЮМІ́НІЮ АКСІ́Д**, гліназём, хімічнае злучэнне *алюмінію* з кіслародам, $Al_2O_3$. Існуе ў крышт. мадыфікацыях, з якіх устойлівыя α-форма ($t_{пл}$ 2053 °С) і γ-форма (вышэй за 900 °С неабарачальна ператвараецца ў α-форму), і ў аморфным стане (гл. *Алюмагель*). У прыродзе α-$Al_2O_3$ — мінерал *карунд* і яго афарбаваныя разнавіднасці *рубін, сапфір* і інш. У вадзе нерастваральны, амфатэрны. α-форма хімічна больш актыўная, гіграскапічная. Атрымліваюць: α-$Al_2O_3$ перапрацоўкай баксітаў, штучны карунд (алунд) плаўкай баксітаў з вугалем, монакрышталі зоннай плаўкай; γ-$Al_2O_3$ награваннем гідраксіду ці соляў алюмінію да 600—900 °С. Выкарыстоўваюць: α-$Al_2O_3$ у вытв-сці алюмінію; алунд у эл.-тэхн. кераміцы, вогнетрывалых матэрыялах для металургічных і эл. печаў; карунд — абразіўны матэрыял; монакрышталі — рабочыя целы для лазераў, апорныя камяні дакладных і гадзіннікавых механізмаў, ювелірныя камяні; ніткападобныя крышталі — для армірання металаў (Al, Ag); γ-$Al_2O_3$ — адсарбент у храматаграфіі, каталізатар, носьбіт каталізатараў.

**АЛЮМІ́НІЮ ЗЛУЧЭ́ННІ**, хімічныя злучэнні, у састаў якіх уваходзіць *алюміній*, пераважна ў ступені акіслення + 3. Бясколерныя, белыя ці шэрыя цвёрдыя рэчывы. Найб. пашыраны А.з. з кіслародам (крышт. *алюмінію аксід* і аморфны *алюмагель*, гідраксід алюмінію), солі алюмінію з моцнымі кіслотамі (нітрат, сульфат, галагеніды, фасфаты), комплексныя солі алюмінію (*алюміневы галын, алюмасілікаты*), солі алюміневых кіслот (*алюмінаты*), алюмінійарган. злучэнні (гл. ў арт. *Металаарганічныя злучэнні*), нітрыд і гідрыд алюмінію, А.з. з некаторымі больш электрададатнымі, чым алюміній, металамі, напр. арсенід алюмінію.

Алюмінію гідраксід [Al(OH)$_3$] сустракаецца ў прыродзе ў выглядзе мінералаў — састаўная частка *баксітаў*, існуе ў трох крышт. і аморфнай мадыфікацыях; не растворацца ў вадзе, спіртах; амфатэрны, з кіслотамі ўтварае солі, са шчолачамі алюмінаты. Атрымліваюць гідролізам алюмасілікатаў у шчолачным асяроддзі, аморфны — асаджэннем з растворaў соляў алюмінію аміякам. Выкарыстоўваюць для вытв-сці аксіду алюмінію і алюмагелю, як адсарбцыйны сродак у медыцыне. Алюмінію сульфат [$Al_2(SO_4)_3$], т-ра раскладання больш за 770 °С, растворацца ў вадзе. Атрымліваецца ўзаемадзеяннем кааліну ці баксіту з сернай кіслатой. Выкарыстоўваюць у вытв-сці алюмініевага гальну, для праклейвання паперы, асвятлення і пазбаўлення колеру вады, як пратраву пры фарбаванні тканін. Алюмінію фтарыд (AlF$_3$), т-ра ўзгонкі 1279 °С, растворацца ў вадзе, утварае крышталегідраты. Кампанент электраліту ў вытв-сці алюмінію, таксама флюсаў, эмаляў, керамікі. Алюмінію хларыд (AlCl$_3$), дыміць на паветры, т-ра ўзгонкі 180 °С, $t_{пл}$ 192,5 °С, у вадзе гідралізуецца. Атрымліваецца хларыраваннем кааліну, баксіту ці гліназёму. Каталізатар крэкінгу нафты, у рэакцыях *алкіліравання*. Алюмінію нітрыд (AlN), т-ра раскладання ~2000 °С, дыэлектрык, устойлівы да дзеяння кіслот і шчолачаў пры t 20 °С. Атрымліваюць узаемадзеяннем азоту з алюмініем пры t 1000 °С ці аднаўленнем аксіду алюмінію. Выкарыстоўваецца як вогнетрывалы матэрыял для тыгляў, футровак электралізных ваннаў, для нанясення каразійна- і зносаўстойлівых пакрыццяў на сталь, графіт і інш. Алюмінію гідрыд (AlH$_3$), т-ра раскладання 105 °С, існуе ў палімерным стане. Выкарыстоўваецца як кампанент цвёрдага ракетнага паліва, аднаўляльнік у арган. сінтэзе.

Алюмінію арсенід (AlAs), т-ра плаўлення 1740 °С, кампанент паўправадніковых цвёрдых растворaў для лазераў, фотадыёдаў, сонечных батарэй. *Л.М.Скрыпнічэнка.*

**АЛЮ́РЫ** (франц. allure літар. хада), віды руху каня. Адрозніваюць А. натуральныя і штучныя. Натуральныя А.: хада (вавольныя А.) — конь паслядоўна падымае і ставіць на зямлю адну за адной усе 4 нагі; змена ног па дыяганалі; рысь — паскораныя А. ў 2 тэмпы: конь перастаўляе адначасова 2 нагі па дыяганалі; інахадзь — А. ў 2 тэмпы: конь падымае і апускае то 2 левыя, то 2 правыя нагі; інахадзь шпарчэй за рысь; галоп — скачкападобныя А. ў 3 тэмпы з безапорнай фазай; скачок — адштурхоўванне ад зямлі наперад адначасова 2 заднімі канечнасцямі. Штучныя А. (у конным спорце і цыркавым мастацтве): парадная хада — конь ідзе рыссю, высока падымаючы і выцягваючы ногі; пасаж — скарочаная рысь; п'яфэ — пасаж на месцы; піруэт — заднія ногі на месцы, пярэднія апісваюць поўны круг.



Алюры: 1 — рысь; 2 — хуткая рысь; 3 — інахадзь (апора на правыя ногі); 4 — інахадзь (фаза свабоднага вісення); 5 — галоп; 6 — скачок.

**АЛЮ́ТАРСКІ ЗАЛІ́Ў**, у Берынгавым м., на ПнУ ад п-ва Камчатка, паміж п-вамі Гавена і Алютарскім. Даўж. 83 км, шыр. на ўваходзе 228 км, глыб. ў паўд. ч. да 1000 м. Утварае бухты Лаўрова і Сумнення. Прылівы няправільныя, паўсутачныя, выш. 0,3—1,9 м. Большую ч.

года ўкрыты лёдам; каля берагоў са снеж. да мая — прыпай.

**АЛЮШКЕ́ВІЧ** Мікалай Восіпавіч (1873, г. Ліда — 1903 ?), дзеяч адной з першых с.-д. арг-цый у Расіі — *Бруснева групы*. Вучыўся ў Лідскім і Пецярбургскім гар. вучылішчах. З 1889 вёў заняткі ў рабочых гуртках у Пецярбургу, друкаваў на гектографе і распаўсюджваў с.-д. выданні. Пасля арышту М.І.Бруснева (1892) аднавіў дзейнасць разгромленай арг-цыі. Падрыхтаваў рэферат «Аб рабочым пытанні ў Расіі і на Захадзе», склаў праект статута арг-цыі. У 1893 арыштаваны. Пасля вызвалення жыў у Ноўгарадзе, у 1896 заснаваў там падп. друкарню. У 1897 зноў арыштаваны, высланы на 3 гады ў Валагодскую губ.

**АЛЯ́Б'ЕЎ** Аляксандр Аляксандравіч (15.8.1787, г. Табольск — 6.3.1851), рус. кампазітар, выдатны майстар раманса. У 1825 памылкова абвінавачаны і арыштаваны, у 1828—43 у ссылцы. З вак. твораў найб. папулярныя «Салавей», «Вячэрні звон». Адзін з першых інтэрпрэтатараў паэзіі А.Пушкіна ў музыцы («Я Вас любіў», «Зімовая дарога» і інш.). Аўтар 6 опер, у т.л. «Месячная ноч, або Дамавікі» (1822), «Амалат-Бек» (1847), балета «Чароўны барабан, або Вынік Чароўнай флейты» (1827), сімф. і камерна-інстр. твораў, у т.л. сімфоніі (1830), фп. трыо, музыкі да драм. спектакляў і вадэвіляў, зборнікаў апрацовак укр. нар. песень.

*Літ.:* Доброхотов Б. Александр Алябьев: Творческий путь. М., 1966.

**АЛЯКСА́НДР** (1190 ? — 31.5.1223), князь дубровіцкі. Верагодна, сын кн. *Глеба Юр'евіча* з тураўскай дынастыі Ізяславічаў, зяць кіеўскага кн. Мсціслава Раманавіча. Упамінаецца ў летапісах з нагоды яго гібелі ў бітве рус. і палавецкіх князёў супраць мангола-татараў на р. Калка.

**АЛЯКСА́НДР** (5.8.1461, Кракаў — 19.8.1506), вял. князь ВКЛ [1492—1506], кароль польскі [1501—06]. Сын *Казіміра IV*, унук *Ягайлы*. Час княжання А. супаў з аднаўленнем шырокага наступлення Маскоўскай дзяржавы на ВКЛ, прыпыненага пры Казіміры IV. У 1492—94 ВКЛ страціла частку сваёй тэр. з гарадамі Мцэнск, Любуцк, Вязьма, Дарагабуж і інш. Жаніцьба А. з дачкою вял. маскоўскага князя *Аленай Іванаўнай* не прывяла да прымірэння. У *вайне Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім 1500—03*, паводле дагавору аб 6-гадовым перамір'і, ВКЛ страціла 25 гарадоў (паводле інш. звестак 19; у т.л. Чарнігаў, Старадуб, Бранск, Гомель). Адначасова А. змушаны быў весці барацьбу з саюзнікамі Масквы — крымска-татарскім ханам Менглі-Гірэем, войскі якога былі разгромлены ў *Клецкай бітве 1506*, і малдаўскім гаспадаром Стафанам. Ва ўнутр. палітыцы А. ішоў на далейшыя ўступкі феадалам ВКЛ (гл. *Прывілей 1492*). Як польскі кароль пашырыў правы шляхты (гл. *Радамская канстытуцыя*). Абранне А. польскім каралём абазначала аднаўленне працэсу аб'яднання дзвюх дзяржаў пад уладай аднаго манарха, які выбіраўся феадаламі Польшчы і ВКЛ. З гэтага часу ў адносінах да абедзвюх дзяржаў пачала ўжывацца назва Рэч Паспалітая, якая пазней стала афіцыйнай. А. — адзіны польскі кароль, пахаваны ў Вільні. *М.І.Ермаловіч.*

**АЛЯКСА́НДР I** (23.12.1777, С.-Пецярбург — 1.12.1825), расійскі імператар [1801—25]. З дынастыі *Раманавых*. Старэйшы сын *Паўла I*. Заняў трон у выніку дварцовага перавароту ў сак. 1801. У першыя гады праўлення з дапамогай т.зв. Тайнага к-та правёў памяркоўна-ліберальныя рэформы: купцы, мяшчане, казённыя сяляне атрымалі права купляць незаселеныя землі (1801); законам пра вольных хлебаробаў памешчыкам дазвалялася вызваляць сялян з зямлёй за выкуп ці адработкі (1803); стварыў мін-вы і К-т міністраў (1802); увёў новае палажэнне пра навуч. ўстановы (1803), засн. Харкаўскі і Казанскі ун-ты, пед. ін-т у Пецярбургу (1804), рэарганізаваў Віленскі ун-т. У адпаведнасці з планам М.М.*Спяранскага* праведзена фін. рэформа (1808—12). У англа-франц. саперніцтве за гегемонію ў Еўропе імкнуўся захаваць нейтралітэт. Аднак з пашырэннем напалеонаўскай агрэсіі Расія ўступіла ў кааліцыю супраць Францыі. Пасля паражэння пад Аўстэрліцам (1805) і Фрыдландам (1807) і заключэння *Тыльзіцкага міру 1807*, паводле якога да Расіі адышоў Беласток з акругай, Расія на баку Францыі далучылася да кантынентальнай блакады Англіі. Напалеон I прызнаў у 1808 правы Расіі на Фінляндыю, Малдову і Валахію, але рус.-франц. супярэчнасці абвастрыліся. Рыхтуючыся да новай вайны з Францыяй, па загадзе А. I пачата буд-ва *Бабруйскай крэпасці*, Дрысенскага лагера. У маі 1812 ён інспектаваў войскі ў Гродне, прысутнічаў на ваен. савеце ў Дрысе. На пач. *вайны 1812* выехаў у Вільню і прыняў вярх. камандаванне рус. арміяй. Падпісаў у Полацку маніфест аб нар. апалчэнні. У 1813—14 узначаліў антыфранц. кааліцыю еўрап. дзяржаў. Адзін з кіраўнікоў *Венскага кангрэса 1814—15* і арганізатараў *Свяшчэннага саюза* (1815). У апошняе дзесяцігоддзе праводзіў рэакц. ўнутр. і знешнюю палітыку (гл. *Аракчэеўшчына*). Пры А. I міжнар. становішча Расіі ўмацавалася, пашырылася яе тэрыторыя: далучаны Грузія (1801), Фінляндыя (1809), Бесарабія (1812), Азербайджан (1813).

**АЛЯКСА́НДР I ГЕО́РГІЕВІЧ** (? — 1511), цар Кахетыі [1492—1511]. У пошуках саюзнікаў у барацьбе супраць пагрозы тур. і іран. набегаў на Кахетыю аднавіў сувязі груз. зямель з Рус. дзяржавай. На пач. 16 ст. стаў васалам іран. шаха Ісмаіла I. Забіты ўласным сынам Гіоргі ў выніку інтрыг, звязаных з барацьбой за Грузію паміж Турцыяй і Іранам.

**АЛЯКСА́НДР I КАРАГЕО́РГІЕВІЧ** (Аляксандар Карађорђевић; 17.12.1888 — 9.10.1934), кароль Югаславіі ў 1921—34. У час *Балканскіх войнаў 1912—13* камандаваў 1-й сербскай арміяй, у 1-ю сусв. вайну — галоўнакамандуючы сербскай арміяй. У 1914—18 прынц-рэгент Сербіі, з 1921 кароль Каралеўства сербаў, харватаў і славенцаў

Вялікі князь ВКЛ Аляксандр.

Аляксандр I.

(з 1929 — Югаславія). У 1929 ажыццявіў дзярж. пераварот і ўстанавіў дыктатуру. Праводзіў велікасербскую ўнутр. палітыку, у знешняй палітыцы арыентаваўся на Францыю. Забіты харвацкімі тэрарыстамі.

**АЛЯКСА́НДР II** (? — 1605), цар Кахетыі [1574—1605]. Пашырыў гандл. сувязі з краінамі Еўропы і Азіі, умацоўваў цэнтр. ўладу. Для ўмацавання абароны краіны аднаўляў гарады-крэпасці і манастыры, набываў у Маскве зброю, выпісваў пушкароў і збройнікаў. Шукаючы збліжэння з Расіяй, у 1587 прыняў прысягу на вернасць цару Фёдару Іванавічу. Забіты ўласным сынам Канстанцінам па загадзе іран. шаха Абаса.

**АЛЯКСА́НДР II** (29.4.1818 — 13.3.1881), расійскі імператар [1855—81]. З дынастыі *Раманавых*. Сын *Мікалая I*. На трон сеў у час няўдалай для Расіі *Крымскай вайны 1853—56*. Крызіс феад.-прыгонніцкага ладу і ўздым сял. хваляванняў прымусілі яго ажыццявіць *сялянскую рэформу 1861* і адмяніць прыгоннае права. У сувязі з *паўстаннем 1863—64* на Беларусі і ў Літве зроблены ўступкі на карысць сялян: спынены іх часоваабавязаныя адносіны з памешчыкамі, паменшаны выкупныя плацяжы, часткова вернуты адрэзкі. У 1860—70-я г. праведзены земская, судовая, гарадская, ваенная, школьная і цэнзурная рэформы. Для барацьбы з нац.-вызв. рухам утвораны *Заходні камітэт 1862—65*. Падзеі 1863—64 прымусілі ўрад А. II умацоўваць сац. базу самадзяржаўя на Беларусі, у Літве і Правабярэжнай Украіне. Не прызнаючы права на самастойнае існаванне бел. народа і яго мовы, на Беларусі ён ажыццяўляў палітыку актыўнай русіфікацыі, прымусовага пераводу бел. насельніцтва ка-

таліцкага веравызнання ў праваслаўе. У час царавання А. II завершана далучэнне да Расіі Казахстана, паўн.-зах. Каўказа, Чэчні, Горнага Дагестана, далучана большая ч. Сярэдняй Азіі, Сахалін. Пераможная руска-турэцкая вайна 1877—78 садзейнічала вызваленню балканскіх народаў ад турэцкага прыгнёту, да Расіі далучаны Паўд. Бесарабія, гарады Карс і Батум. У знешняй палітыцы змагаўся за адмену дыскрымінацыйнага *Парыжскага мірнага дагавора 1856.* Забіты нарадавольцам І.Я.Грынявіцкім у Пецярбургу.



Расійскі імператар **Аляксандр II.**

Расійскі імператар **Аляксандр III.**

*Літ.:* Захарова Л.Г. Александр II // Российские самодержцы, 1801—1917. М., 1993.

**АЛЯКСА́НДР III** (Alexander; свецкае Раланда Бандынелі; Rolando Bandinelli; ? — 30.8.1181), папа рымскі з 1159. Юрыст і тэолаг, праф. кананічнага права ў Балонні. Папскі легат у Германіі, з 1153 папскі канцлер. Імкнуўся да верхавенства ўлады папства. З гэтай мэтай вёў паспяховую барацьбу з імператарам *Фрыдрыхам I* Барбаросам з дапамогай *Ламбардскай лігі.* Асудзіў англ. караля *Генрыха II* за забойства Т.Бекета (1170) і прымусіў яго прызнаць уладу папаў.

**АЛЯКСА́НДР III** (10.3.1845 — 1.11.1894), расійскі імператар [1881—94]. З дынастыі *Раманавых.* Сын *Аляксандра II.* Наследнікам прастола стаў пасля смерці (1865) старэйшага брата. Прыхільнік інтарэсаў найб. кансерватыўных колаў дваранства і буйных землеўладальнікаў, непахіснай самадзяржаўнай улады (29.4.1881 прыняты адпаведны маніфест). У 1883 у гонар сваёй каранацыі амністыраваў удзельнікаў *паўстання 1863—64.* Прымаючы пад увагу тэндэнцыі капіталіст. развіцця краіны, правёў у 1880-я г. рэформы: панізіў выкупныя плацяжы б. прыгонных сялян (1881), часоваабавязаных сялян перавёў на абавязковы выкуп (1883), у еўрап. ч. Расіі адмяніў падушны падатак (1887). З канца 1880-х г. пачаўся перыяд адкрытай рэакцыі і т.зв. контррэформаў: уведзены ін-т земскіх начальнікаў (1889, на Беларусі з 1900), перагледжаны земскія і гарадавыя палажэнні, ліквідавана універсітэцкая аўтаномія, узмацніліся нац. прыгнёт нярускіх народаў, уціск нац. культур, русіфікацыя; па Украіне і Беларусі пракацілася хваля яўр. пагромаў. Знешняя палітыка вызначалася міралюбівасцю. У перыяд яго царавання ў асноўным завершана далучэнне да Рас. імперыі Сярэдняй Азіі (1885), заключаны франка-рус. саюз (1891—93), адносіны з Германіяй і Аўстра-Венгрыяй пагоршыліся.

*Літ.:* Твардовская В.А. Александр III // Российские самодержцы, 1801—1917. М., 1993.

**АЛЯКСА́НДР VI** (Alexander; свецкае Радрыга Борджа; Rodrigo Borgia; 1.1.1430 ці 1431 — 18.8.1503), папа рымскі з 1492. Імкнуўся стварыць у цэнтры Італіі моцную дзяржаву, дзеля чаго падтрымліваў заваёўніцкія планы свайго сына Чэзарэ Борджа, прадаваў царк. пасады, збіраў крыжаносную дзесяціну, канфіскоўваў маёмасць заможных асоб. Паліт. праціўнікаў ліквідаваў з дапамогай атруты і кінжала. У 1497 адлучыў ад царквы свайго праціўніка *Саванаролу* і садзейнічаў пакаранню яго смерцю. На пачатку *італьянскіх войнаў 1494—1559* лавіраваў паміж варагуючымі бакамі.

**АЛЯКСА́НДР АФРАДЫСІ́ЙСКІ**, старажытнагрэчаскі філосаф, кіраўнік перыпатэтычнай школы ў Афінах (канец 2 — пач. 3 ст.); найб. уплывовы каментатар *Арыстоцеля.* Для А.А. характэрны эмпірычны натуралізм і рэальнасць часу. У каментарыі да твора «Пра душу» развіў арыгінальную канцэпцыю траістасці розуму, якая паўплывала на сярэдневяковую араб. і еўрап. філасофію. Зберагліся яго каментарыі да асобных твораў Арыстоцеля, а таксама самастойныя т.зв. «малыя творы» «Пра душу», «Пра лёс», «Апарыі і рашэнні» (у 3 кн.), «Маральныя праблемы», «Пра зліццё і рост».

**АЛЯКСА́НДР ДО́БРЫ** (? — 1432), маладаўскі гаспадар (правіцель) у 1400—32. Рэарганізаваў войска, фінансы, упарадкаваў судаводства, праз раздачу гандл. прывілеяў купцам спрыяў развіццю гарадоў. Заваяваў порт Кілію ў вусці Дуная, у 1410 і 1422 аказаў ваен. дапамогу Польшчы ў войнах з тэўтонцамі. Садзейнічаў цэнтралізацыі і ўмацаванню незалежнасці *Малдаўскага княства.*

**АЛЯКСА́НДР МАКЕДО́НСКІ**, Аляксандр III Вялікі (Alexandros ho Megas; 21.7.356 да н.э., г. Пела — 10.6.323 да н.э.), цар Македоніі [336—323], славуты палкаводзец і дзярж. дзеяч стараж. свету. Сын *Філіпа II.* Выхавальнікам яго быў *Арыстоцель.* Упершыню вызначыўся ў бітве пры Херанеі (338). У 336—335 расправіўся з прэтэндэнтамі на трон і аднавіў макед. панаванне ў Грэцыі. У 334 — пач. 327, каб пераадолець эканам. і сац. крызіс грэч. гарадоў-дзяржаў (полісаў), здзейсніў паходы супраць перс. дзяржавы. Пасля перамог на р. Гранік (334), пры Ісе (333), Гаўгамелах (331) і інш. падпарадкаваў сабе царства *Ахеменідаў,* захапіўшы велізарныя багацці. У 329—328 заваяваў Сярэднюю Азію. З вясны 327 да 325 ажыццявіў інд. паход, заняў Пенджаб (бітва каля р. Гідасп у 326), імкнуўся дасягнуць даліны р. Ганг, але, змушаны войскам, вярнуўся ў заваяваны раней Вавілон, зрабіў яго сталіцай сваёй дзяржавы. Раптоўна памёр. Паходы А.М. спрыялі ажыўленню гандл. абмену паміж Усходам і Захадам, станаўленню эліністычнай матэрыяльнай і духоўнай культуры (заснаваны больш за 70 гарадоў, у т.л. *Александрыя,* Герат, Кандагар). Створаная ім самая вялікая стараж. дзяржава (ад Балкан у Еўропе да Індыі і паўд. граніц Егіпта), пазбаўленая цесных унутр. сувязяў, развалілася пасля яго смерці. На яе тэр. ўзнік шэраг эліністычных дзяржаў.

*Літ.:* Шифман И.Ш. Александр Македонский. Л., 1988; Бойназаров Ф.А. Проблемы традиции и современности: Образ и личность Александра Македонского. М., 1990; Маринович Л.П. Греки и Александр Македонский: К проблеме кризиса полиса. М., 1993.

**АЛЯКСА́НДР НЕ́ЎСКІ** (каля 1200 — 14.11.1263), князь наўгародскі [1236—51], вял. князь уладзімірскі (з 1252). Праводзіў палітыку абароны паўн.-зах. зямель Русі ад шведаў, якіх разбіў у *Неўскай бітве 1240*, пасля чаго стаў звацца Неўскім. Выйграў бітву супраць крыжаносцаў у *Лядовым пабоішчы 1242*. Імкнуўся ўстанавіць мірныя адносіны з Залатой Ардой. Маючы на мэце аб'яднанне сіл у барацьбе са шведска-ням. экспансіяй, падтрымліваў цесныя сувязі з Полацкам. У 1239 ажаніўся з Аляксандрай, дачкой полацкага князя Брачыслава Васількавіча. На адной з пячатак князя была выява конніка, якая нагадвала герб «Пагоня». Пасля смерці кананізаваны правасл. царквой. У Расіі з 1725 і ў СССР з 1942 быў уведзены ваенны ордэн А.Н.

**АЛЯКСА́НДРА АРХІПЕЛА́Г** (Alexander Archipelago), каля зах. ўзбярэжжа Паўн. Амерыкі, у Ціхім ак., частка тэр. ЗША, штат Аляска. Пл. 36,8 тыс. км$^2$. Каля 1100 а-воў і скал; найбольшыя а-вы: Баранава, Прынца Уэльска , Адміралцейства, Чычагова і інш. Рэльеф горны, са слядамі стараж. зледзяненняў. Выш. да 1432 м. Берагі стромкія, моцна расчлянёныя, часткова фіёрдавыя. Складзены з інтрузіўных і метамарфічных парод. Клімат умераны, марскі. Сярэдняя т-ра студз. ад -1,6 °С на Пн да 1,2 °С на Пд; ліп. адпаведна 12 °С і 14 °С. Ападкаў ад 2000 да 3000 мм за год. Да выш. 1000—1100 м хваёвыя лясы (сітхінская елка і інш.), якія змяняюцца альпійскімі лугамі. Рыбалоўства, звераградоўля, лесараспрацоўкі. Нацыянальны парк Адміралці. Адкрыты ў 1741 рус. экспедыцыяй В.Берынга і А.Чырыкава. Да 1867 належаў Расіі.

**АЛЯКСА́НДРА І ЗЯМЛЯ́**, паўднёва-заходняя частка Антарктычнага п-ва ў Антарктыдзе. Злучана з мацерыком шэльфавым ледавіком Георга VI. Працягласць з Пн на Пд каля 400 км, з У на З — 200 км. Над ледавіковым покрывам горы (выш. да 2987 м, г. Стывенсан). Адкрыта ў 1821 рус. экспедыцыяй Ф.Ф.Белінсгаўзена і М.П.Лазарава.

**АЛЯКСА́НДРА ФЁДАРАЎНА** (сапр. Аліса Вікторыя Алена Луіза Беатрыса; 25.5.1872—16.7.1918), апошняя рас. імператрыца, жонка *Мікалая II* (з 1894). Дачка вял. герцага гесен-дармштацкага Людовіка IV. Была прыхільніцай неабмежаванага самадзяржаўя, узначальвала германафільскія групоўкі пры двары, бязмежна давярала авантурысту Р.Я.*Распуціну*, які выкарыстоўваў яе прыхільнасць пры вырашэнні важных паліт. пытанняў. У час 1-й сусв. вайны патранавала службу Чырв. Крыжа, была ў прыфрантавой зоне, на Зах. фронце, у тл. ў Мінску і Магілёве. Расстраляна разам з царскай сям'ёй у Екацярынбургу.

**АЛЯКСА́НДРАВЫ**, рускія кампазітары і харавыя дырыжоры, бацька і сын.

Аляксандр Васілевіч (13.4.1883, с. Плахіна Захараўскага р-на Разанскай вобл. — 8.7.1946), нар. арт. СССР (1937). Д-р мастацтвазнаўства (1940). Ген.-маёр (1943). Скончыў Маскоўскую кансерваторыю (1913), з 1918 выкладаў у ёй (праф. з 1922). Арганізатар (1928) і кіраўнік Ансамбля песні і танца Сав. Арміі (цяпер яго імя). Прызнанне атрымалі яго песня «Свяшчэнная вайна» і апрацоўка далёкаўсх. партыз. песні «Па далінах і па ўзгорках». Аўтар музыкі былога Дзярж. гімна СССР (1943). Пісаў оперы, вак.-сімф., інстр. творы. Дзярж. прэмія СССР 1942 і 1946. У 1971 устаноўлены залаты і 3 сярэбраныя медалі імя А. за лепшыя творы на ваен.-патрыят. тэму. Барыс Аляксандравіч (4.8.1905, г. Балагое — 18.6.1994), нар. арт. СССР (1958). Герой Сац. Працы (1975). Ген.-маёр (1973). Скончыў Маскоўскую кансерваторыю (1929), у 1933—41 выкладаў у ёй. З 1929 дырыжор, у 1946—86 нач. і маст. кіраўнік Ансамбля песні і танца Сав. Арміі. Аўтар шматлікіх песень, аперэт, у тл. «Вяселле ў Малінаўцы» (1937), балета «Ляўша» (1954), араторый і інш. Ленінская прэмія 1978, Дзярж. прэмія СССР 1950, Дзярж. прэмія РСФСР 1985. Залаты медаль імя А.В.Аляксандрава (1971). Памяці бацькі прысвяціў кн. «Песня кліча» (1982).

Аляксандр Неўскі. Цэнтральная частка трыпціха П.Дз.Корына. 1942.

*Літ.:* Поляновский Г. А.В.Александров. 2 изд. М., 1983.

**АЛЯКСА́НДРА-НЕ́ЎСКАЯ ЛА́ЎРА** ў Санкт-Пецярбургу, помнік архітэктуры 18 ст. Засн. Пятром I у 1710 на ўшанаванне памяці *Аляксандра Неўскага* як манастыр; з 1797 лаўра (буйны мужчынскі праваслаўны манастыр). У арх. ансамбль лаўры ўвахо-

Аляксандр Македонскі.

дзяць Благавешчанская царква (1717—22, арх. Д.Трэзіні, Т.Швертфегер), Фёдараўскі корпус з царквой (1740—50, арх. П.Трэзіні), Троіцкі сабор у стылі класіцызму (1776—90, арх. І.Староў) і інш. На тэр. лаўры створаны дзярж. запаведнік, дзе размешчаны Музей гар. скульптуры з некропалем 18 ст. (Лазараўскія могілкі з надмагільнымі помнікамі работы І.Мартаса, М.Казлоўскага і інш.) і некропалем майстроў мастацтваў (Ціхвінскія могілкі). У А.-Н.л. пахаваны М.В.Ламаносаў, А.В.Суворaў, М.М.Карамзін, І.А.Крылоў, П.І.Чайкоўскі, Ф.М.Дастаеўскі, М.І.Глінка і інш.

Благавешчанская царква Аляксандра-Неўскай лаўры.

**АЛЯКСА́НДРАЎ**, горад у Расіі, цэнтр раёна ва Уладзімірскай вобл. 68,2 тыс. ж. (1994). Чыг. вузел. Машынабудаванне (вытв-сць тэлевізараў), хім. (вытворчасць штучнай скуры), лёгкая, харч. прам-сць. Гіст.-арх. і маст. музей

«Аляксандраўская слабада». Вядомы з 14 ст. У 1564—72 рэзідэнцыя рус. цара Івана Грознага. У А. адна з першых рус. друкарняў. Помнікі архітэктуры 16—17 ст.

**АЛЯКСА́НДРАЎ** Аляксандр Паўлавіч (н. 20.2.1943, Масква), сав. касманаўт. Двойчы Герой Сав. Саюза (1983, 1987),

Анатоль Пятровіч Аляксандраў. М.М.Аляксандраў.

лётчык-касманаўт СССР (1983). Скончыў Маскоўскае вышэйшае тэхн. вучылішча імя М.Э.Баўмана (1969). З 1978 у атрадзе касманаўтаў. Як борт-інжынер здзейсніў касм. палёты з У.А.*Ляхавым* на караблі «Саюз Т-9» і арбітальнай станцыі «Салют-7» (27.6—23.11.1983), з А.С.Віктарэнкам і М.А.Фарысам на караблі «Саюз ТМ-3» і арбітальным комплексе «Мір» (22.7—29.12.1987). У космасе правёў 309,7 сут.

**АЛЯКСА́НДРАЎ** Анатоль Мікалаевіч (25.5.1888, Масква — 16.4.1982), рускі кампазітар, піяніст, педагог. Нар. арт. СССР (1971). Д-р мастацтвазнаўства (1941). Скончыў Маскоўскую кансерваторыю (1916), з 1923 выкладаў у ёй (праф. з 1926). Працаваў у многіх жанрах, найб. плённа ў вакальным. Аўтар цыклаў рамансаў «З Александрыйскіх песень М.Кузьміна» (4 сш.), «Вернасць» (Дзярж. прэмія СССР 1951) і інш., опер «Бэла» (1941), «Дзікая Бара» (1957), «Ляўша» (1975), сімф. і камерна-інстр. твораў, музыкі да драм. спектакляў і кінафільмаў.

*Літ.:* Кокушкин В. Анатолий Александров. М., 1987.

**АЛЯКСА́НДРАЎ** Анатоль Пятровіч (13.2.1903, г. Тарашча Кіеўскай вобл., Украіна — 4.2.1994), сав. фізік. Акад. АН СССР (1953, чл.-кар. 1943). Адзін з заснавальнікаў сав. атамнай энергетыкі. Герой Сац. Працы (1954, 1960, 1973). Скончыў Кіеўскі ун-т (1930). З 1960 дырэктар Ін-та атамнай энергіі імя Курчатава, у 1975—86 прэзідэнт АН СССР. Навук. працы па фізіцы цвёрдага цела і палімераў, ядз. і атамнай фізіцы. Распрацоўваў (у саўт.) стат. тэорыю трываласці цвёрдых целаў. З 1946 працаваў над стварэннем ядз. рэактараў, у т.л. для атамнай энергетыкі і флоту; пад яго кіраўніцтвам створаны першы доследны вода-вадзяны рэактар (1948—54). Ленінская прэмія 1959, Дзярж. прэміі СССР 1942, 1949, 1951, 1953.

*Тв.:* Атомная энергия и научно-технический прогресс. М., 1978; Наука — стране. М., 1983.

**АЛЯКСА́НДРАЎ** Георгій Фёдаравіч (7.4.1908, С.-Пецярбург — 21.7.1961), філосаф і грамадскі дзеяч. Акад. АН СССР (1946). Скончыў Маскоўскі ін-т гісторыі і філасофіі (1932). Нач. Упраўлення прапаганды і агітацыі ЦК ВКП(б) (1940—47), дырэктар Ін-та філасофіі АН СССР (1947—54), міністр культуры СССР (1954—55). З 1955 у Ін-це філасофіі АН БССР. Аўтар прац: «Арыстоцель» (1940), «Гісторыя сацыялогіі як навука» (1956), «Нарыс гісторыі сацыяльных ідэй у старажытнай Індыі» (1959) і інш. За ўдзел у стварэнні «Гісторыі філасофіі» (т. 1—3, 1940—43) і за кн. «Гісторыя заходнееўрапейскай філасофіі» (2-е выд. 1946) Дзярж. прэміі СССР 1943 і 1946.

**АЛЯКСА́НДРАЎ** Мікалай Мікалаевіч (11.6.1917, Бранск, Расія — 7.10.1981), бел. анколаг. Чл.-кар. АМН СССР (1974), д-р мед. н. (1955), праф. (1962). Герой Сац. Працы (1977). Скончыў Ваен.-мед. акадэмію імя Кірава ў Ленінградзе (1940). З 1950 на кафедры факультэтнай хірургіі гэтай акадэміі. З 1960 дырэктар НДІ анкалогіі і мед. радыялогіі Мін-ва аховы здароўя Беларусі, адначасова заг. кафедры анкалогіі Бел. ін-та ўдасканалення ўрачоў. Працы па тэорыі пухлінаўтварэння, біяхіміі, імуналогіі, дыягностыцы і лячэнні злаякасных пухлін, арганізацыі проціракавай барацьбы на Беларусі.

*Тв.:* Операционный риск и интенсивная терапия в онкологической клинике. Мн., 1976 (у саўт.); Применение гипертермии и гипергликемии при лечении злокачественных опухолей. М., 1980 (у саўт.).

**АЛЯКСА́НДРАЎ** Павел Сяргеевіч (7.5.1896, г. Нагінск, Расія — 16.11.1982), сав. матэматык; заснавальнік навук. школы па тапалогіі. Акад. АН СССР (1953, чл.-кар. 1929). Герой Сац. Працы (1969). Скончыў Маскоўскі ун-т (1917), з 1929 праф. там жа. Навук. працы па тапалогіі, тэорыі мностваў і тэорыі функцый сапраўднай пераменнай. Стварыў тэорыю бікампактных прастораў, метады камбінаторнага (алгебраічнага) даследавання мностваў і прастораў, тэорыю размернасці. Віцэ-прэзідэнт Міжнар. матэм. асацыяцыі (з 1958). Дзярж. прэмія СССР 1943.

*Тв.:* Комбинаторная топология. М.; Л., 1947; Введение в общую теорию множеств и функций. М.; Л., 1948; Введение в теорию групп. 2 изд. М., 1951.

**АЛЯКСА́НДРАЎ** (сапр. Марманенка) Рыгор Васілевіч (23.1.1903, Екацярынбург, Расія — 16.12.1983), рускі кінарэжысёр і сцэнарыст. Нар. арт. СССР (1948). Герой Сац. Працы (1973). Праф. (1951). З 1921 акцёр Першага рабочага т-ра Пралеткульта ў Маскве. З 1924 працаваў у кіно як акцёр, асістэнт, сурэжысёр С.*Эйзенштэйна* (фільмы «Стачка», «Браняносец Пацёмкін»). З 1933 ставіў фільмы самастойна. Стварыў жанр муз.-эксцэнтрычнай камедыі: «Вясёлыя хлопцы» (1934), «Цырк» (1936, Дзярж. прэмія СССР 1941), «Волга-Волга» (1938), «Светлы шлях» (1940), «Вясна» (1947). З інш. фільмаў: «Сустрэча на Эльбе» (1949, Дзярж. прэмія СССР 1950), «Рускі сувенір» (1960). Аўтар сцэнарыяў амаль усіх сваіх фільмаў.

**АЛЯКСА́НДРАЎ** Сямён Іосіфавіч (24.5.1920, в. Засарыхіна Гарадзецкага р-на Ніжагародскай вобл., Расія — 16.12.1980), бел. акцёр. Засл. арт. Беларусі (1967). Скончыў Горкаўскае тэатр. вучылішча (1952). З 1959 у Гродзенскім абл. драм. т-ры. Выканаўца драм. і характарных роляў, спалучаў псіхал. і пластычны малюнак вобраза. Сярод роляў: Сенатар («Францыск Скарына» А.Петрашкевіча), Моцкін («Выбачайце, калі ласка!» А.Макаёнка), Бераст («Платон Крэчат» А.Карнейчука), Трыстан («Сабака на сене» Лопэ дэ Вэгі).

**АЛЯКСА́НДРАЎ ПРЫВІЛЕ́Й 1492**, заканадаўчы акт у ВКЛ, дадзены вял. кн. *Аляксандрам*. Разам з *прывілеем 1447* замацоўваў прынцыпы міжнар. палітыкі дзяржавы, абмяжоўваў уладу вял. князя панамі-радай, без згоды якіх ён не мог прымаць важных рашэнняў, вызначаў асновы адм., цывільнага і крымін. права. Быў своеасаблівай феад. канстытуцыяй, крыніцай пісанага права, нормы якога пазней увайшлі ў Статуты ВКЛ 1529, 1566 і 1588.

**АЛЯКСА́НДРАЎКА**, вёска ў Беларусі, у Малаяўцюкоўскім с/с Калінкавіцкага р-на Гомельскай вобл. Цэнтр саўгаса «Галявічы». За 12 км на У ад Калінкавіч, 110 км ад Гомеля, 0,5 км ад чыг. ст. Галявіцы. 491 ж., 224 двары (1995). Базавая школа, клуб, аддз. сувязі. Брацкія магілы сав. воінаў.

**АЛЯКСА́НДРАЎСКІ КАФЛЯ́НЫ ЗАВО́Д**. Дзейнічаў на Беларусі ў 1873—1914 у в. Аляксандраўка Слаўгарадскага р-на Магілёўскай вобл. Вырабляў кафлю, тэракоту, паліву. У 1895 былі 2 конныя рухавікі. У 1898 працавалі 59, у 1913 — 38 рабочых. У канцы 19 ст. ўзнікла акц. кампанія «Аляксандраўскія кафляныя заводы» з новымі з-дамі ў Аляксандраўцы і Прапойску (цяпер г. Слаўгарад).

**АЛЯКСЕ́ЕВА** Ларыса Філалогаўна (н. 29.10.1907, г. Луцк Валынскай вобл., Украіна), бел. спявачка (лірыка-каларатурнае сапрана). Нар. арт. Беларусі (1944). Скончыла муз. тэхнікум імя Гнесіных у Маскве (1936). У 1937—41 і 1944—46 салістка Дзярж. т-ра оперы і балета БССР. У 1946—48 у Вялікім т-ры. Валодала голасам прыгожага тэмбру, высокай вак. культурай, сцэнічнай абаяльнасцю. Сярод партый: Русалка («Кветка шчасця» А.Туранкова), Караліна («Дрыгва», пазней «У пушчах Палесся» А.Багатырова), Марфачка

(«Алеся» Я.Цікоцкага, канцэртнае выкананне, 1944), Марфа («Царская нявеста» М.Рымскага-Корсакава), Джыльда, Віялета («Рыгалета», «Травіята» Дж.Вердзі), Мікаэла («Кармэн» Ж.Бізэ), Разіна («Севільскі цырульнік» Дж.Расіні). У канцэртны рэпертуар уключала бел. нар. песні. *Б.С.Смольскі.*

**АЛЯКСЕ́ЕВА** Таццяна Іванаўна (н. 7.2.1928, Казань), расійскі антраполаг. Д-р гіст. н. (1969), акад. Рас. АН (1992). Скончыла Маскоўскі ун-т (1951). Працуе ў НДІ антрапалогіі імя Дз.М.Анучына. Распрацавала комплексную праграму морфафізіял. даследаванняў у антрапалогіі, па ёй вывучала насельніцтва розных рэгіёнаў Усх. Еўропы. Даследавала краніялагічныя серыі ўсх. славян 11—15 ст. у параўнанні з матэрыяламі пахаванняў зах. і паўд. славян, балцкіх і фіна-угорскіх плямёнаў.

*Тв.:* Этногенез восточных славян по данным антропологии. М., 1973; Географическая среда и биология человека. М., 1977; Адаптивные процессы в популяциях человека. М., 1986. *Л.І.Цягака.*

**АЛЯКСЕ́ЕВА** Таццяна Міхайлаўна (н. 15.6.1920, Мінск), бел. рэжысёр радыё. Засл. дз. культ. Беларусі (1971). Скончыла Ленінградскі тэатр. ін-т (1945). У 1941—42, 1946—49 у Бел. т-ры імя Я.Купалы, потым у Белдзяржфілармоніі, на кінастудыі «Беларусьфільм». У 1956—76 на Бел. радыё (з 1971 гал. рэжысёр рэдакцыі для дзяцей і юнацтва). Радыёпастаноўкі А. дакладна раскрываюць маст. якасці твора, вызначаюцца глыбокай распрацоўкай характараў, нац. каларытам, выхаваўчай накіраванасцю.

**АЛЯКСЕ́ЕВА** Таццяна Назараўна (н. 9.10.1922, г. Сяміпалацінск, Казахстан), бел. актрыса. Засл. арт. Беларусі (1955). Сцэн. дзейнасць пачала ў Кіеўскім т-ры муз. камедыі (1943). З 1948 на Беларусі: працавала ў Брэсце, Магілёве; з 1952 у Нац. т-ры імя Я.Купалы. Актрыса лірыка-драм. плана, валодае высокай сцэн. культурай, псіхал. распрацоўку ролі спалучае з дакладным вонкавым малюнкам: Вікця («Людзі і д'яблы» К.Крапівы), Юлія Тугіна, Кручыніна («Апошняя ахвяра», «Без віны вінаватыя» А.Астроўскага), Луіза («Каварства і каханне» Ф.Шылера), Джульета і Алена («Рамэо і Джульета», «Канец — справе вянец» У.Шэкспіра), Агнія («Традыцыйны збор» В.Розава). Тонкі гумар уласцівы камед. персанажам: Адэля («Ажаніцца не журыцца» Далецкіх і М.Чарота), Маці («Дзверы стукаюць» М.Фермо), Паўла («Гульня з кошкай» І.Эркеня).

**АЛЯКСЕ́ЕВІЧЫ,** вёска ў Беларусі, у Немяржанскім с/с Драгічынскага р-на Брэсцкай вобл. Цэнтр калгаса. За 19 км на ПнЗ ад Драгічына, 106 км ад Брэста, 16 км ад чыг. ст. Драгічын. 675 ж., 274 двары (1995). Базавая школа, б-ка, клуб, аддз. сувязі.

**АЛЯКСЕ́ЕНКА** Барыс Леанідавіч (23.7.1910, г. Кіраваград, Украіна — 23.9.1944), бел. акцёр. Вучыўся ў Адэскім муз.-драм. ін-це імя Бетховена (1929—31). Працаваў у 1-м Кіеўскім рабочым т-ры. З 1934 у Бел. т-ры рабочай моладзі, з 1937 у БДТ-1. Выканаўца характарных роляў: Ясь («Кацярына Жарнасек» М.Клімковіча), Мацейка («Прымакі» Я.Купалы ў спектаклі «Вечар камедый»), Фабіо («Дурная для іншых, разумная для сябе» Лопэ дэ Вэгі) і інш.

**АЛЯКСЕ́ЕЎ** Валерый Паўлавіч (2.8.1929, Масква — 7.11.1991), расійскі антраполаг і гісторык. Акадэмік АН СССР (1988), д-р гіст. н. (1967). Скончыў Маскоўскі ін-т усходазнаўства (1952). Працаваў у Ін-це этнаграфіі АН СССР. З 1988 дырэктар Ін-та археалогіі АН СССР. Распрацоўваў праблемы станаўлення чалавецтва, геаграфіі чалавечых рас, методыкі антрапалаг. даследаванняў; даследаваў стараж. і сучаснае насельніцтва Усх. Еўропы, у т.л. беларусаў 19 ст., а таксама Каўказа, Сібіры, Манголіі, Індыі, Кубы і інш.

*Тв.:* География человеческих рас. М., 1974; Историческая антропология. М., 1979; Этногенез. М., 1986; Очерки экологии человека. М., 1993; Расавая геаграфія беларусаў і праблемы этнагенезу. Мн., 1994 (разам з М.У.Вітавым, Л.І.Цягакай). *Л.І.Цягака.*

**АЛЯКСЕ́ЕЎ** Васіль Іванавіч (н. 7.1.1942, с. Пакрова-Шышкіна Разанскай вобл., Расія), расійскі спартсмен (цяжкая атлетыка). Чэмпіён Алімпійскіх гульняў у 2-й цяжкай вазе (1972, Мюнхен, 1976, Манрэаль), чэмпіён свету (1970—71, 1973—75, 1977—78), Еўропы (1970—75, 1977—78), СССР (1970—76). У 1970—78 устанавіў 80 сусв. рэкордаў.

**АЛЯКСЕ́ЕЎ** Герт Іванавіч (н. 17.3.1936, в. Усценанка Ульянаўскай вобл., Расія), бел. вучоны ў галіне тэхн. кібернетыкі. Д-р тэхн. н. (1989). Засл. вынаходнік Беларусі (1984). Скончыў мех. і радыётэхн. ф-ты Львоўскага політэхн. ін-та (1958, 1964). З 1968 у Ін-це тэхн. кібернетыкі АН Беларусі. Навук. працы па функцыянальным пераўтварэнні інфармацыі, тэарэт. асновах і праектаванні эл.-магн. планшэтных сродкаў уводу графічнай інфармацыі, прыладах выліч. тэхнікі.

*Тв.:* Воспроизведение функций средствами цифро-аналоговой вычислительной техники. Мн., 1976; Электромагнитные планшетные устройства ввода. Мн., 1985.

**АЛЯКСЕ́ЕЎ** Іван Епіфанавіч (14.4.1909, Полацк — 16.1.1943), Герой Сав. Саюза (1943). Скончыў Кіеўскую артыл. школу (1933). Служыў у БВА. На фронце з 1941, удзельнік абароны Масквы. У студз. 1943 танк. брыгада палкоўніка А. прарвала абарону праціўніка ў Варонежскай вобл., прайшла 70 км па яго тылах, вызваліла дзесяткі нас. пунктаў, чыг. ст. Росаш. Загінуў у баі.

**АЛЯКСЕ́ЕЎ** Леанід Васілевіч (н. 15.1.1921, г. Растоў-на-Доне), расійскі і бел. археолаг, гісторык. Д-р гіст. н. (1982). Скончыў Маскоўскі ун-т (1948). З 1948 у Гродзенскім гісторыка-археал. музеі, Ін-це гісторыі АН Беларусі. З 1953 у Ін-це археалогіі Рас. АН. У 1962—66 выкладаў археалогію ў Магілёўскім пед. ін-це. Вёў раскопкі Браслава, Друцка, Мсціслава, Рослаўля, вывучаў гісторыю археалогіі, архітэктуры, мастацтва і краязнаўства гэтых рэгіёнаў. Даследаваў гісторыю Смаленскай і Полацкай зямель.

*Тв.:* Полоцкая земля в IX—XIII вв.: (Очерки истории Северной Белоруссии). М., 1966; По Западной Двине и Днепру в Белоруссии. М., 1974; Смоленская земля в IX—XIII вв.: Очерки истории Смоленщины и Восточной Белоруссии. М., 1980.

П.С.Аляксандраў.

Л.Ф.Аляксеева.

**АЛЯКСЕ́ЕЎ** Мікалай Іванавіч (17.12.1898, С.-Пецярбург — 12.8.1985), рускі пісьменнік. Засл. работнік культуры Беларусі (1980). У 1918—58 у арміі, прайшоў шлях ад салдата да ген.-маёра. Літ. дзейнасць пачаў у 1939. Аўтар раманаў «Якаў Жалязноў» (1946), «Выпрабаванне» (1957), «Па закліку сэрца» (1974) пра мужнасць людзей у барацьбе з ням.-фаш. захопнікамі, аповесцяў «Сухар» (1971, пра пагранічнікаў), «Асколкам абарванае жыццё» (1978, пра І.Д.Чарняхоўскага), п'есы «Сястра Варвара» (паст. ў 1960 Бабруйскім вандроўным тэатрам).

**АЛЯКСЕ́ЕЎ** Міхаіл Васілевіч (15.11.1857, Цвярская вобл. — 8.10.1918), рускі ваенны дзеяч, адзін з арганізатараў *белай гвардыі*. Генерал ад інфантэрыі (1914). Удзельнік рус.-тур. (1877—78), рус.-яп. (1904—05) войнаў. Скончыў Акадэмію Генштаба (1890). У 1-ю сусв. вайну нач. штаба Паўд.-Зах. фронту, галоўнакамандуючы Паўн.-Зах. фронтам; у жн. 1915 — сак. 1917 нач. штаба Стаўкі вярх. галоўнакамандуючага ў Магілёве. У сак.—маі 1917 вярх. галоўнакамандуючы, потым ваенны саветнік Часовага ўрада, нач. штаба вярх. галоўнакамандуючага. Пасля Кастр. рэв. стварыў разам з Л.Г.*Карнілавым* і А.І.*Дзянікіным* і ўзначаліў на Паўн. Каўказе *добраахвотніцкую армію* і белагвардзейскі ўрад — «Асобую нараду».

**АЛЯКСЕ́ЕЎ** Міхаіл Мікалаевіч (н. 6.5.1918, с. Манастырскае, Саратаўская вобл., Расія), рускі пісьменнік. Герой Сац. Працы (1978). Скончыў Вышэйшыя літ. курсы ў Маскве (1957). У 1968—90 гал. рэдактар час. «Москва».

Падзеі Вял. Айч. вайны, армейскія будні адлюстраваны ў рамане «Салдаты» (1951—53), аповесцях «Наследнікі» (1957), «Дывізіёнка» (1959), зб-ках апавяданняў «Наш лейтэнант» (1955), «Жылі-былі два таварышы...» (1958), мінулае і сучаснае жыццё вёскі — у раманах і аповесцях «Вішнёвы вір» (1961), «Хлеб — імя назоўное»

Цар Аляксей Міхайлавіч.

(1964; фільм пад назвай «Жураўлік»), «Каруха» (1968), «Вярба неплакучая» (кн. 1—2, 1971—75; Дзярж. прэмія СССР 1976), «Задзіры» (1981) і інш.

**АЛЯКСЕ́ЕЎ** (літ. псеўд. Асколдаў) Сяргей Аляксеевіч (1870 — 23.5.1945), расійскі філосаф. Скончыў Пецярбургскі ун-т. Да сярэдзіны 1920-х г. праф. Політэхн. ін-та (Петраград). У 1921 заснаваў тайнае рэліг.-філас. т-ва (у 1926 перайменавана ў «Брацтва св. Серафіма Сароўскага»). У 1928 арыштаваны і сасланы ў Комі АССР. З 1935 жыў у Ноўгарадзе. Пасля Вял. Айч. вайны эмігрыраваў у Германію. Аўтар кн. «Крытыка дыялектычнага матэрыялізму», у якой развіваў вучэнне аб трансцэндэнтальнасці прадмета ведаў, сімвалічнасці пазнання, крытыкаваў уяўленні аб суб'екце пазнання за яго «безаблічнасць» і падмену індывід. разумення. У аснове яго анталогіі вучэнне пра ўзаемадзеянне душ.

*Тв.:* Основные проблемы теории познания и онтологии. Спб., 1900; Мысль и действительность. М., 1914; Сознание как целое: Психол. понятие личности. М., 1918.

**АЛЯКСЕ́ЕЎ** Фёдар Якаўлевіч (паміж 1753 і 1755, С.-Пецярбург — 23.11.1824), рускі жывапісец. Скончыў Пецярбургскую АМ (1773), яе акадэмік з 1794. У 1773—77 удасканальваў майстэрства ў Венецыі, дзе пісаў пейзажы («Набярэжная Ск'явоні ў Венецыі», 1775, Нац. маст. музей Беларусі). Першы ў рус. жывапісе стварыў гар. пейзажы: «Выгляд Палацавай набярэжнай ад Петрапаўлаўскай крэпасці» (1800—02), «Красная плошча ў Маскве» (1801), «Від на горад Бахчысарай», «Плошча ў горадзе Мікалаеве» і інш.

*Літ.:* Алексеев: Альбом / Авт.-сост. И.М.Жаркова. М., 1981. *М.М.Паграноўскі.*

**АЛЯКСЕ́ЕЎ** Яўген Кузьміч (2.2.1884, г.п. Вісіма-Уткінск Прыгараднага р-на Свярдлоўскай вобл. — 21.1.1972), бел. аграном-раслінавод. Акад. АН Беларусі (1940), Акадэміі с.-г. навук Беларусі (1957—61), д-р с.-г. навук (1936), праф. (1951). Скончыў Казанскі настаўніцкі ін-т (1903) і Вышэйшыя с.-г. курсы ў Пецярбургу (1911). З 1916 дырэктар Навазыбкаўскай с.-г. доследнай станцыі, у 1928—30 праф., заг. кафедры БСГА; у 1937—59 у Маскоўскім зоатэхн. ін-це, адначасова ў 1946—59 у Бел. НДІ земляробства. Асн. працы па агратэхніцы і выкарыстанні зялёных угнаенняў (сідэратаў) на розных глебах розных кліматычных зон.

*Тв.:* Зернебабовыя культуры ў БССР. Мн., 1953; Зеленое удобрение. Мн., 1970 (разам з В.С.Рубанавым, К.І.Доўбанам).

**АЛЯКСЕ́ЕЎКА**, вёска ў Беларусі, у Брагінскім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр Крыўчанскага с/с. За 17 км на У ад г.п. Брагін, 147 км ад Гомеля, 43 км ад чыг. ст. Хойнікі. 282 ж., 120 двароў (1994). Сярэдняя школа, б-ка, Дом культуры, бальніца, аддз. сувязі.

**АЛЯКСЕ́ЕЎСКІ** Канстанцін Аляксеевіч (15.9.1855, Віленская губ. — пасля 1918), удзельнік бел. нац. руху пач. 20 ст. Скончыў 2-е Канстанцінаўскае ваен. вучылішча ў Пецярбургу (1875). Ген.-маёр (1909). З 1915 нач. Свеаборгскай крэпасці. На Усебеларускім з'ездзе 1917 выбраны ў склад Савета старэйшын, заклікаў «адрадзіць беларускую дзяржаву», выступаў у абарону бел. нац. сцяга. Аўтар «Успамінаў пра Усебеларускі з'езд у г. Мінску» (Чырвоны шлях. 1918. № 1—2). У 1918 запрошаны Радай БНР у Мінск для фарміравання бел. нац. арміі. *В.У.Скалабан.*

**АЛЯКСЕ́Й**, Аляксій (1314—78), рускі мітрапаліт з 1354. У час княжання ў Маскве Івана Іванавіча Краснага і малалецтва кн. *Дзмітрыя Іванавіча Данскога* фактычна ўзначальваў урад. Падтрымліваў Дзмітрыя ў барацьбе з цвярскімі і суздальска-ніжагародскімі князямі, выступаў супраць намаганняў князёў ВКЛ стварыць асобную мітраполію ў Кіеве. Прыхільнік пагаднення з Залатой Ардой дзеля прадухілення набегаў на Маскоўскае княства. У 1448—49 кананізаваны правасл. царквой.

**АЛЯКСЕ́Й І КАМНІ́Н** (Alexios Komnēnos; каля 1048—15.8.1118), візант. імператар [1081—1118]. Заснавальнік дынастыі Камнінаў. Захапіў трон з дапамогай ваен. знаці. Душыў феад. мяцяжы, праследаваў удзельнікаў ерэтычных рухаў паўліцыян і багамілаў. На пач. 1090-х г. адбіў націск нарманаў, сельджукаў, у 1091 — печанегаў. Прымусіў крыжаносцаў у час 1-га крыжовага паходу перадаць Візантыі частку М. Азіі.

**АЛЯКСЕ́Й МІХА́ЙЛАВІЧ** (19.3.1629—29.1.1676), рускі цар [1645—76]. З дынастыі *Раманавых*. Сын *Міхаіла Фёдаравіча*. Выхоўваўся баярынам Б.І.Марозавым, які з 1645 фактычна правіў у Маскве. А.М. пачаў правіць краінай з 1648, калі паабяцаў маскоўскім паўстанцам адхіліць Марозава ад спраў. Удзельнічаў у складанні і зацвярджэнні *Саборнага ўлажэння 1649*. Для ўзмацнення цэнтралізацыі кіравання дзяржавай у 1654 стварыў «Прыказ тайных спраў». Правёў пасадскую (1649—52), царкоўную (гл. *Раскол*), мытныя (гл. *Гандлёвы статут 1653, Новагандлёвы статут 1667*), грашовую (1654—63) і інш. рэформы, рэарганізаваў узбр. сілы, прыцягваў на службу іншаземцаў. Пры ім адбыліся паўстанні гараджан у Ноўгарадзе і Пскове (1650), *Салавецкае паўстанне 1668—76, Сялянская вайна 1670—71*. У час *вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67* на чале адной з армій заняў у 1654—56 каля 200 бел. гарадоў, мястэчак, замкаў, у т.л. Вільню, пасля чаго стаў тытулаваць сябе «ўсяе Вялікія, Малыя і Белыя Русі самадзержцам»; раздаваў бел. землі рас. дваранам і баярам, прымусова перасяляў жыхароў Беларусі (асабліва рамеснікаў) у Расію. Вёў так-

Ф.Аляксееў. Красная плошча ў Маскве. 1801.

сама вайну Расіі са Швецыяй 1656—58 і інш. Аўтар нясканчаных мемуараў пра вайну 1654—67.

**АЛЯКСЕ́Й ПЯТРО́ВІЧ** (18.2.1690 — 16.6.1718), рускі царэвіч. Старэйшы сын *Пятра I*. Выхоўваўся ў варожым да Пятра I асяроддзі, быў уцягнуты ў змову духавенства і баярства супраць цара. У 1716 уцёк у Вену, спадзеючыся на падтрымку аўстр. імператара Карла VI. У 1718 вернуты ў Расію і асуджаны на пакаранне смерцю. Верагодна, па загадзе Пятра I быў задушаны ў Петрапаўлаўскай крэпасці.

**АЛЯКСІ́Й** (Сіманскі Сяргей Уладзіміравіч; 9.11.1877, Масква — 17.4.1970), патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі. Скончыў маскоўскія ун-т (1899) і духоўную акадэмію (1904). Быў рэктарам Тульскай і Наўгародскай духоўных семінарый. У сане епіскапа з 1913. У 1943—45 мітрапаліт Ленінградскі і Наўгародскі. У 1945 на памесным саборы ў Маскве абраны патрыярхам.

**АЛЯКСІ́Й II** (да пастрыжэння ў манахі Рыдзігер Аляксей Міхайлавіч; н. 23.2.1929, г. Талін), патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі. Скончыў ленінградскія духоўную семінарыю (1949) і духоўную акадэмію (1953) са ступенню кандыдата багаслоўя. З 1950 свяшчэннік і настаяцель царквы ў г. Іыхві Талінскай епархіі, з 1957 настаяцель Успенскага сабора г. Тарту. У 1961 пастрыжаны ў манахі, узведзены ў сан архімандрыта, потым епіскапа Талінскага і Эстонскага. З 1964 архіепіскап, з 1968 мітрапаліт. З 1964 кіраўнік справамі Маскоўскай патрыярхіі, з 1986 мітрапаліт Ленінградскі і Наўгародскі. У 1990 выбраны патрыярхам Маскоўскім і ўсяе Русі. *Г.М.Шэйкін.*

**АЛЯКСЮ́К** Павел Паўлавіч (10.12.1892, Гродна — ?), паліт. дзеяч. Скончыў Пецярбургскі ун-т (1915). З 1909 нам. старшыні Гродзенскага гуртка бел. моладзі. У 1915 адзін з заснавальнікаў Бел. т-ва дапамогі пацярпелым ад вайны ў Вільні. У 1917 уваходзіў у БСГ, потым у Бел. нар. партыю сацыялістаў; нам. старшыні Бел. нац. к-та ў Мінску. З кастр. 1917 чл. выканкомаў Вял. бел. рады і Цэнтр. бел. вайсковай рады. Адзін з ініцыятараў абвяшчэння БНР, у 1918 у складзе Нар. сакратарыята Беларусі. У 1919 чл. Цэнтр. бел. рады Віленшчыны і Гродзеншчыны. У 1919—20 узначальваў Бел. вайсковую камісію. З восені 1920 старшыня Бел. паліт. к-та ў Варшаве. Падтрымаў ваен. акцыю С.Н.Булак-Балаховіча на Беларусі. У 1921 стварыў паланафільскую арг-цыю «Беларуская краёвая сувязь». У 1920-я г. працаваў адвакатам у Навагрудку. Далейшы лёс невядомы. *С.С.Рудовіч.*

**АЛЯНЁК**, рака на Пн Сібіры, у Рэспубліцы Саха (Якуція), вярхоўе — у Краснаярскім краі Расійскай Федэрацыі. Даўж. 2292 км, пл. бас. каля 220 тыс. км². Пачынаецца і цячэ па Сярэдне-Сібірскім пласкагор'і, у нізоўях — па Паўд.-Сібірскай нізіне. Упадае ў Алянёцкі заліў мора Лаптевых, утвараючы дэльту. У верхнім цячэнні парожыстая, даліна месцамі мае выгляд цясніны. У сярэднім цячэнні даліна пралягае сярод хвалістай мясцовасці. Асн. прытокі: Арга-Сала, Бур (злева), Сілігір (справа). Жыўленне снегавое і дажджавое. Паводка з чэрв. да верасня. Ледастаў з канца вер.—кастр. да канца мая — 1-й пал. чэрвеня. У верхнім цячэнні перамярзае са студз. да красавіка. Сярэдні расход вады ў вусці 1210 м³/с. Суднаходная ў нізоўях. Багатая рыбай (рапушка, омуль, муксун, нельма і інш.).

**АЛЯНЁЦКІ ЗАЛІ́Ў**, у моры Лаптевых, паміж а-вамі дэльты р. Лена на У, мацерыком на Пд і З, каля берагоў Расійскай Федэрацыі. Даўж. 65 км, шыр. каля 130 км, глыб. да 15 м. Вялікі в-аў Джангылах. Упадаюць р. Алянёк, Алянёцкая пратока р. Лена і інш. Амаль увесь год укрыты лёдам.

Аляксій.

Аляксій II на плошчы Перамогі ў Мінску. 1991.

**АЛЯ́ПКА**, вадзяны верабей (Cinclus cinclus), птушка сямейства аляпкавых атр. вераб'інападобных. Пашырана ў Еўразіі і паўд.-зах. Афрыцы. На Беларусі вельмі рэдкі аселы від, занесены ў Чырвоную кнігу.

Даўж. да 20 см, маса да 70 г. Моцнага складу, з кароткімі закругленымі крыламі і хвастом, доўгімі нагамі. Апярэнне зверху буравата-шэрае, знізу белае. На ноздрах скурыстая перапонка. Гнёзды паблізу рэк з хуткім цячэннем, трымаецца паасобку і парамі. Зімой трапляецца каля палонак. Корміцца воднымі беспазваночнымі і маляўкамі рыб. Можа прабегчы пад вадой да 20 м. Выводзіць 2 патомствы за год.

**АЛЯ́СКА** (Alaska), адкрыты заліў Ціхага ак., каля берагоў Паўн. Амерыкі, паміж п-вам Аляска і в-вам Ванкувер. Пл. 384 тыс. км², шыр. каля ўвахода больш за 2200 км, глыб. да 4929 м. Прылівы паў-

Аляпка.

сутачныя (да 12 м) і мяшаныя (да 6,8 м). У заліве А. — архіпелагі Кадзьяк, Аляксандра і а-вы Каралевы Шарлоты. Гал. парты: Сьюард (ЗША), Прынс-Руперт (Канада).

**АЛЯ́СКА** (Alaska), паўвостраў на ПнЗ Паўн. Амерыкі (ЗША, штат Аляска), паміж Брыстольскім зал. Берынгава м. і Ціхім акіянам. Даўж. каля 700 км, шыр. да 170 км. Найб. выш. 2507 м (вулкан Веніямінава). Гарысты Алеуцкі хр. з дзеючым (Катмай, 2047 м) і патухлымі вулканамі. Горныя тундры, невял. ледавікі. Уздоўж паўн.-зах. ўзбярэжжа нізіны са шматлікімі азёрамі, субарктычныя лугі.

**АЛЯ́СКА** (Alaska), штат ЗША, на ПнЗ Паўн. Амерыкі. Аддзелены ад асн. часткі ЗША тэр. Канады. Акрамя мацерыковай часткі займае Алеуцкія а-вы, архіпелаг Аляксандра і інш. Пл. 1477 тыс. км², нас. 599 тыс. чал. (1993). Адм. цэнтр — г. Джуна. Найб. гарады Анкарыдж, Кетчыкан, Сітка і Фэрбанкс. Пераважае гар. насельніцтва, якое сканцэнтравана на ПдУ, каля палавіны — у Анкарыджы. На Пн і ў цэнтр. ч. А. расчлянёнае плато, якое пераходзіць у прыбярэжную нізіну, на Пд Аляскінскі

хр. з найвыш. пунктам Паўн. Амерыкі г. Мак-Кінлі (6193 м). Вял. рэкі Юкан і Кускакуім. Клімат халодны, кантынентальны. Сярэдняя т-ра паветра ў студз. ад -1,6 °С да -24,8 °С, ліп. 13,3—15,7 °С. Ападкаў на Пн каля 300 мм, на Пд 1500—4000 мм за год. Шматгадовая мерзлата, тундры і рэдкія лясы на Пн, хваёвыя лясы ў гарах на Пд. Па далінах рэк невял. плошчы, прыдатныя для земляробства. Вядучая галіна гаспадаркі — горназдабыўная: нафта, газ, вугаль, золата, руды серабра, медзі, ртуці і інш. Лясная, рыбная прам-сць. Жывёлагадоўля (паўн. алені, буйн. раг. жывёла, зверагадоўля), паляўніцтва. Вырошчваюць ячмень, сеяныя травы, бульбу. Турызм. Транспарт марскі, авіяцыйны, аўтамабільны, чыгуначны. Трансаляскінскі нафтаправод перасякае А. з Пн на Пд.

На думку многіх вучоных, продкі сучасных карэнных жыхароў А. (індзейцаў, эскімосаў, алеутаў) паходзяць з Паўн.-Усх. Азіі. У 17 ст. эскімосы жылі пераважна ў прыбярэжных раёнах, алеуты — на п-ве, індзейцы — на паўд.-ўсх. узбярэжжы (тлінкіты і хайда) і ва ўнутр. раёнах А. (*атапаскі*). У 1730-я г. А. даследавалі рус. экспедыцыі П.Нагібіна, В.Берынга, А.Мельнікава, І.Фёдарава, М.Гвоздзева, але адкрыццё А. звязваюць з экспедыцыяй А.Чырыкава ў 1741. Першае рус. паселішча засн. ў 1784 на в-ве Кадзьяк. У 1798 рус. купцы стварылі «злучаную амерыканскую кампанію» (з 1799 наз. Рас.-Амер. кампанія), у карыстанне якой былі перададзены ўсе промыслы і выкапні на паўн.-зах. беразе Амерыкі ад 55° паўн. ш. да Берынгава пралівa, на а-вах Алеуцкіх, Курыльскіх і інш. Цэнтрам А. стаў г. Нова-Архангельск (цяпер Сітка). Першы гал. правіцель рус. паселішчаў у Амерыцы — А.Баранаў (1790—1818). Валоданне А. прыводзіла Расію да канфліктаў з Англіяй і ЗША. У 1821 рас. імператар Аляксандр I забараніў замежным суднам плаваць уздоўж берагоў рас. уладанняў на А., але неўзабаве Расія была вымушана дазволіць ЗША (1824) і Англіі (1825) мараходства і гандаль у гэтым раёне на льготных умовах. У 1839 англ. кампанія Гудзонава заліва атрымала ў арэнду на выгадных умовах частку прыбярэжнай паласы рас. уладанняў. У час *Крымскай вайны 1853—56* царскі ўрад не меў неабходных сіл у раёне Ціхага ак. для абароны сваіх паселішчаў у Паўн. Амерыцы, таму вырашыў прадаць А. ЗША у разліку на іх падтрымку ў барацьбе за ліквідацыю ўмоў *Парыжскага мірнага дагавора 1856*. Паводле дагавора 30.3.1867 А. была прададзена ЗША за 7,2 млн. долараў (каля 11 млн. руб.). У канцы 19 ст. ў блізка размешчаным раёне Канады (Клондайк), а потым і на тэр. А. былі адкрыты вял. радовішчы золата, што выклікала т.зв. «залатую ліхаманку». У 1867—84 А. ў падпарадкаванні ваен. мін-ва ЗША, у 1884—1912 — акруга на чале з губернатарам, у 1912 пераўтворана ў «тэрыторыю» ЗША, з 1959 — штат.

**АЛЯ́СКІНСКАЕ ЦЯЧЭ́ННЕ**, цёплае паверхневае цячэнне ў паўн.-ўсх. ч. Ціхага ак., паўн. галіна *Паўночна-Ціхаакіянскага цячэння*. Т-ра вады 2—7 °С зімой, 10—15 °С летам. Скорасць 0,9—1,8 км/гадз. Праходзіць з Пд на Пн, затым з У на З у заліве Аляска; праз усх. пралівы Алеуцкіх а-воў уваходзіць у Берынгава мора.

**АЛЯ́СКІНСКІ ХРЫБЕ́Т** (Alaska Range), на Пд Аляскі, у Ціхаакіянскім поясе Кардыльераў Паўн. Амерыкі (ЗША). Даўж. каля 1000 км. Сярэдняя выш. каля 3000 м, найб. — 6191 м (г. Мак-Кінлі самая высокая вяршыня Паўн. Амерыкі). Восевая ч. хрыбта складзена з інтрузіўных (пераважна гранадыярытаў), па краях — з асадкавых парод. Схілы стромкія, моцна расчлянёныя. А.х. — важны клімата- і водападзел. На паўд. увільготненых схілах да выш. 800 м яловыя лясы, вышэй — вечныя снягі, буйныя ледавікі; на паўн. больш сухіх схілах мяжа лесу павышаецца да 1000—1200 м, вышэй — горныя тундры.

**АЛЯСКІ́Т** (ад назвы п-ва Аляска, дзе ўпершыню знойдзены), інтрузіўная субшчолачная горная парода; *граніт*, у якім менш за 5% цёмнаколерных мінералаў. Складаецца з каліевага палявога шпату (каля 65%) і кварцу (каля 35%). Структура крышт.-зярністая, радзей парфірападобная. Колер мяса-чырвоны, ружовы, белы, светла-шэры. Магматычнага, іншы раз метасаматычнага паходжання. Утварае буйныя масівы. Выкарыстоўваецца ў выт-сці шкла, тонкай керамікі, як буд. друз і аблiцовачны камень.

Тундра Аляскі.

**АЛЯХНО́ВІЦКАЕ ЎЗВЫ́ШША**, паўн.-зах. частка *Радашковіцкага ўзвышша*, у Маладзечанскім р-не Мінскай вобл. Абмежавана далінамі рэк Бярэзіна (прыток Нёмана) на ПдЗ, Уша (прыток Вілii) на Пн і Нарачана-Вілейскай ні-

зінай на У. Комплекс градава-ўзгорыстага, дробна- і сярэднеўзгорыстага (выш. да 313 м на ПнЗ) марэннага рэльефу. Глыбіня эразійнага расчлянення рэльефу да 10—20 м. Ускраіны ўзвышша маюць стромкія схілы ў бок рачных далін і нізіны. Складаецца з марэнных суглінкаў і супескаў, перакрытых лёсападобнымі пародамі невял. магутнасці. Большая частка А.ў. разарана. Хмызнякі і лясы (ялова-дубова-хваёвыя групоўкі) захаваліся на схілах узвышша.

*Л.А.Нічыпарэнка.*

**АЛЯХНО́ВІЧ** Галіна Іванаўна (н. 22.11.1930, Мінск), бел. вучоны-эканаміст. Д-р эканам. н. (1981), праф. (1987). Скончыла БДУ (1954). З 1970 працуе ў БДУ. Асн. даследаванні па эканам. праблемах нар. гаспадаркі Беларусі і рыначнай сістэмы сучаснага капіталізму.

*Тв.:* Экономика Белоруссии в условиях Великой Отечественной войны (1941—1945). Мн., 1982; Экономическая система современного капитализма. Мн., 1988 (разам з С.В.Мачэрным); Государственно-монополистический капитализм: Сущность и национальные особенности. Мн., 1991 (з ім жа).

**АЛЯХНО́ВІЧ** Мікалай Міхайлавіч (н. 2.5.1935, в. Варонічы Слонімскага р-на Гродзенскай вобл.), бел. фізік. Чл.-кар. АН Беларусі (1989), д-р фізіка-матэм. н. (1987), праф. (1991). Скончыў БДУ (1957). З 1968 у Ін-це фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў АН Беларусі, з 1994 яго дырэктар. Навук. працы па хім. сувязі ў цвёрдых целах, рэнтгенаўскім аналізе рэальных крышталёў, фазавых пераходах пры высокіх цісках і т-рах, высокатэмпературнай звышправоднасці.

*Тв.:* Интегральные характеристики дифракции рентгеновских лучей в монокристаллах с хаотическим распределением дислокаций // Металлофизика. 1986. № 1.

**АЛЯХНО́ВІЧ** Мікола (Мікалай Мікалаевіч; 21.4.1903, г. Барысаў — 9.4.1959), бел. крытык. Вучыўся на мед. ф-це (1921—24), скончыў пед. ф-т БДУ (1930). У 1930—36 выкладчык Бел. вышэйшага пед. ін-та, адначасова ў 1932—34 у Ін-це мовы, л-ры і мастацтва АН Беларусі. У ліст. 1936 арыштаваны, асуджаны на 12 гадоў і сасланы на Калыму. Працаваў урачом у лагерным медпункце. З 1945 у г. Тайшэт Іркуцкай вобл., з 1956 у Карагандзінскай вобл. Рэабілітаваны ў 1957. Жыў у Ленінградзе. Друкаваўся з 1919. У 1925—27 кіраўнік Барысаўскай філіі «Маладняка». Даследаваў творчасць М.Багдановіча, А.Александровіча, П.Труса, Я.Скрыгана і інш. Аддаў даніну вульгарнаму сацыялагізму.

*І.У.Саламевіч.*

**АЛЯХНО́ВІЧ** (Olechnowicz) Мсціслаў Антонавіч (22.2.1905, Гродна — 24.7.1982), польскі лінгвіст. Д-р гуманіт. (1963) і пед. (1966) навук, праф. (1974). Скончыў Віленскі ун-т (1938). З 1949 выкладчык, з 1954 заг. кафедры замежных моў, з 1966 кафедры рус. філалогіі Лодзінскага ун-та. Даследаваў рус. і бел. мовы, бел. фальклор, рус.-бел.-польска-літоўскія фальклорныя і моўныя сувязі. Аўтар манаграфіі «Польскія даследчыкі беларускага фальклору і мовы ў XIX ст.» (1986), прац «Польскія зацікаўленні беларускай мовай (ад паловы XVI стагоддзя да 1863 г.)» (1964), «Даследчыкі палескага фальклору ў першай палове XIX стагоддзя» (1965), «Беларускія элементы ў польскай песні першай паловы XIX стагоддзя» (1966), «Беларусь—Палессе» Оскара Кольберга» (1968), «Сістэма націску назоўнікаў з вытворнай асновай у беларускай мове» (1972), «Тэндэнцыі развіцця беларускага націску (на параўнальным фоне націску рускага)» (1978) і інш.

*Літ.:* Саламевіч І. Polskі daslednчyk Беларусі // ЛіМ. 1975. 21 лют.; Bibliografia publikacji naukowych i dydaktycznych prof. dra habil. Mścisława Olechnowicza // Acta Universitatis Lodziensis. Zeszyty Naukowe Uniwersytetu Łódzkiego. Ser. 1. 1979. № 33.

*І.У.Саламевіч.*

**АЛЯХНО́ВІЧ** Францішак Каролевіч (псеўд. Ю.Монвід і інш.; 9.3.1883, Вільня — 3.3.1944), бел. драматург і тэатр. дзеяч, публіцыст, празаік. Скончыў драм. школу пры Муз. т-ве ў Варшаве (1907). З 1908 у Вільні, рэпарцёр газет, выдаваў польскі гумарыстычны тыднёвік «Perkunas» («Пяркунас»). Удзельнічаў у арганізацыі 1-й бел. вечарынкі ў Вільні, паставіў з драм. гурткom «Па рэвізіі» М.Крапіўніцкага, дзе выступаў і як акцёр. За арт. у «Пяркунасе» трапіў пад суд, хаваўся ў Кракаве, у Галіцыі, дзе быў акцёрам польск. правінц. труп. Пасля амністыі 1913 вярнуўся ў Вільню, але быў зняволены ў Лукішскую турму. У 1916 арганізаваў у Вільні тэатр. гурток, з якім паставіў напісаную ў турме ў 1914—15 сваю першую п'есу «На Антокалі» і інш. У 1917 настаўнік у дзіцячым прытулку, супрацоўнік бел. газ. «Гоман». З чэрв. 1918 у Мінску, акцёр і рэжысёр *Першага беларускага таварыства драмы і камедыі, Беларускага савецкага тэатра.* З сак. 1919 у Вільні, выдаваў час. *»Беларускае жыццё»*, спрабаваў арганізаваць тэатр. З восені 1919 дырэктар і рэжысёр Бел. нар. т-ра ў Мінску, дзе ставіў свае п'есы. З ліп. 1920 у Вільні, у 1921—23 рэдагаваў газ. *«Беларускі звон»*. У ліст. 1926 прыехаў у Мінск на акад. канферэнцыю і адкрыццё БДТ-2 у Віцебск. У 1927 арыштаваны органамі АДПУ і прыгавораны да 10 гадоў высылкі на Салаўкі. У выніку абмену на вязня польскай турмы Б.Тарашкевіча ў вер. 1933 вярнуўся ў Вільню, супрацоўнічаў у газ. «Słowo» («Слова»). У 1940—41 на нелегальным становішчы. У 1942—44 у Вільні, рэдагаваў газ. «Беларускі голас». Забіты ў сваёй кватэры. Вядомы 18 п'ес А.: «На вёсцы», «Бутрым Няміра» (абедзве нап. 1916), «Манька» (нап. 1917, 2-я рэд. «Дрыгва», 1925), «Базылішк» (нап. 1917), «Чорт і баба», «Страхі жыцця» (абедзве нап. 1918), «Дзядзька Якуб», «Цені» (нап. 1919), «Птушка шчасця», «Няскончаная драма» (абедзве нап. 1920), «Заручыны Паўлінкі» (1921), «Шчаслівы муж», «Пан міністр» (нап. 1922), «Круці не круці — трэба памярці» (1943) і інш. Яны адметныя сцэнічнасцю, фальклорнасцю, паэтыкай, напружанасцю і дынамізмам дзеяння, займальнай інтрыгаю, разнастайнасцю характараў, меладраматызмам. Гэта яркае тэатр. відовішча з музыкай, танцамі, песнямі. Некаторыя створаны па літ. творах («Бутрым Няміра» паводле легенды

Ф.К.Аляхновіч.

В.Ластоўскага «Каменная труна», «Лес шуміць» паводле аднайм. палескай легенды У.Караленкі, «Птушка шчасця» паводле камедыі К.Марашэўскага, «Заручыны Паўлінкі» створаны як заканчэнне купалаўскай «Паўлінкі»). Яго п'есы жанрава разнастайныя: сац. і бытавая драма, сатыр. і быт. камедыя, меладрама, фарс. У многіх адлюстравана мяшчанскае асяроддзе і яго трагедыя. У драме «Цені» — творы бел. дэкадансу — філас. канцэпцыя пра бездапаможнасць чалавека перад лёсам. Цэнтр. месца ў творчасці А. займае «Няскончаная драма» (у многім аўтабіяграфічная, падзеі адбываюцца ў Вільні ў час акупацыі герм. войскам). У ёй аўтар супрацьпастаўляе два погляды на бел. ідэю, бел. адраджэнскі рух. У камедыі «Пан міністр» стварыў вобразы псеўдабеларускага дзеяча, кар'ерыста Філімона Пупкіна і настаўніка-адраджэнца Міколы Светляка. П'еса «Круці не круці — трэба памярці» — сцэнічны гратэск з вобразам смерці, алегорыяй тэрору ў часы сталінізму. Пісаў таксама аповесці, апавяданні, абразкі, вершы. У дакумент. аповесці-ўспамінах «У капцюрох ГПУ» (1937, пер. на 7 моў) упершыню ў бел. л-ры паказаў антычалавечую сутнасць сав. канцлагернай сістэмы. Аповесць «Страшны год» (1944) узнаўляе перажытае аўтарам у 1940—41. Кн. «Беларускі тэатр» (1924) пра гісторыю нац. сцэнічнага мастацтва ад старажытнасці да пач. 20 ст. П'есы А. шырока ставіліся ў Зах. Беларусі, трупай У.Галубка. З 1994 зноў з'явіліся на бел. сцэне.

*Тв.:* Калісь. Вільня, 1919; Страхі жыцця. Вільня, 1919; Цені. Мн., 1920; Птушка шчасця. Вільня, 1922; Шчаслівы муж. Вільня, 1922; У лясным гушчары. Рыга, 1932; Няскончаная драма // Полымя. 1992. № 5; Пан міністар // Беларуская драматургія. Мн., 1994. Вып. 1; У капцюрох ГПУ. Мн., 1994; Круці не круці — трэба памярці // Тэатр. Беларусь. 1995. № 4.

*Літ.:* Карский Е.Ф. Белорусы. Пг.,

1922. Т. 3, вып. 3. С. 366—371; Гарэцкі М. Гісторыя беларускае літаратуры. Мн., 1992. С. 358—364; Крывіцкі Л. Францішак Аляхновіч // Ніва. 1990. № 2—3; Сабалеўскі А. Адметны след // Спадчына. 1990. № 3; Яго ж. На адраджэнцкай хвалі // Полымя. 1992. № 5; Бяляцкі А. «Як я памру...» // Маладосць. 1990. № 10; Глыбінны У. Тэатр у гады нямецкай акупацыі // Тэатр. Беларусь. 1994. № 4; Ковель У.А. Наватарскія тэндэнцыі ў беларускай драматургіі пачатку XX ст. (на прыкладзе п'есы Ф.Аляхновіча «Страхі жыцця») // Весці АН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 1994. № 4; Яго ж. Жыцця нясканчаная драма // Тэатр. Беларусь. 1995. № 4. *Г.В.Кажамякін.*

**АЛЯХНО́ВІЧЫ**, Алёхнавічы, вёска ў Беларусі, у Маладзечанскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 28 км на ПдУ ад Маладзечна, 55 км ад Мінска, чыг. ст. на лініі Мінск—Маладзечна. 3244 ж., 1181 двор (1995). Птушкафабрыка, сярэдняя школа, клуб, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі.

У 19 ст. вёска і фальварак у Краснасельскай вол. Вілейскага пав. У 1872 пракладзена чыгунка, у 1885 пабудаваны вакзал. З 1921 у складзе Польшчы. У А. дзейнічалі гурткі Бел. сял.-работніцкай грамады. З 1939 у БССР, з 1940 цэнтр сельсавета. У 1942 у А. размяшчаўся лагер смерці для ваеннапалонных. У 1948 арганізаваны калгас «Новае жыццё», у 1955 саўгас «Аляхновіцкі».

**АЛЯХНО́ВІЧЫ**, шляхецкі род герба «Ляліва», прадстаўнікі якога ў 15—16 ст. займалі дзярж.-адм. пасады ў ВКЛ. У 16 ст. ад іх адталінаваліся роды Іржыкавічаў, Кухмістравічаў, Дарагастайскіх. Найб. вядомыя А.:

Алехна, сын Рымавіда, заснавальнік роду А. Намеснік гарадзенскі (1456), маршалак надворны ВКЛ пры Казіміру IV. Яго брат Юрый — заснавальнік роду *Забярэзінскіх*. Пётр (? — 1516), сын Алехны, кухмістр ВКЛ (1492), пасол на соймы, намеснік ушанскі (1514—16). Андрэй, сын Алехны, пасол ВКЛ у Маскву (1493). Намеснік ожскі і пшэломскі (1494). Мікалай (? — каля 1548), сын Пятра, мечнік ВКЛ (1547).

Магчыма, да гэтага роду належаў Міхал (1746—82), родам са Жмудзі, педагог-піяр, праф. права ў Гал. школе ВКЛ.

*В.Р.Баравы, Л.Л.Чарняўская.*

**АЛЯШКЕ́ВІЧ** Васіль Антонавіч (28.1.1893, в. Еськавічы Нясвіжскага р-на Мінскай вобл. — 18.7.1972), адзін з кіраўнікоў партыз. руху на Беларусі ў грамадз. вайну. У час герм. акупацыі Беларусі арганізатар і камісар партыз. атрада ў Слуцкім пав., у час польскай інтэрвенцыі камісар партыз. атрада М.А.Кухарчыка (дзейнічаў у ваколіцах Ляхавіч і Клецка), арганізатар партыз. атрада імя III Інтэрнацыянала ў Бабруйскім пав. Удзельнік барацьбы супраць войскаў Булак-Балаховіча.

**АЛЯШКЕ́ВІЧ** Іван Баніфатавіч (26.11.1900, в. Ізабеліна Кіраўскага р-на Магілёўскай вобл. — 2.7.1977), бел. хірург. Д-р мед. н., праф. (1949). Засл. дз. нав. Беларусі (1969), засл. ўрач Беларусі (1959). Скончыў Кіеўскі мед. ін-т (1926). З 1949 заг. кафедры ў Віцебскім мед. ін-це, з 1965 у Бел. ін-це ўдасканалення ўрачоў. Навук. працы па хірург. лячэнні хвароб страўнікава-кішачнага тракту і жоўцевага пузыра, траўматычным шоку, анаэробнай інфекцыі.

**АЛЯШКЕ́ВІЧ** Іосіф Іванавіч (1777, мяст. Шылува, Літва — 5.10.1830), бел. жывапісец-партрэтыст. З сям'і музыканта з мяст. Радашковічы (Маладзечанскі р-н). Скончыў Віленскую маст. школу (1803), працаваў у майстэрнях франц. мастакоў Ж.А.Д.*Энгра* і Ж.Л.*Давіда*. З 1810 жыў у Пецярбургу. Часта прыязджаў на Беларусь. Стварыў шмат партрэтаў у стылі позняга класіцызму і рамантызму, у т.л. Л.Сапегі, М.Радзівіла, А.Чартарыйскага, Г.Ржавускага, Плятэра, аўтапартрэт, «Групавы партрэт», «Жаночы партрэт», «Партрэт дзяўчынкі», партрэт А.Бакунінай (апошнія 4 захоўваюцца ў Нац. маст. музеі Беларусі) і інш. Сябраваў з А.Міцкевічам, напісаў яго партрэт (1828).

**АЛЯШКЕ́ВІЧ** Фёдар Васілевіч (н. 5.5.1936, в. Балотца Навагрудскага р-на Гродзенскай вобл.), бел. нейрахірург. Чл.-кар. АН Беларусі (1994). Д-р мед. н. (1973), праф. (1980). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1959). З 1961 у Бел. НДІ неўралогіі, нейрахірургіі і фізіятэрапіі. З 1973 у Мінскім мед. ін-це. Навук. працы па сасудзістай паталогіі галаўнога і спіннога мозга, эпілепсіі, гідрацэфаліі, радыкуліце, пухлінах галаўнога мозга. Распрацаваў мікранейрахірургічную тэхніку для лячэння чэрапна-мазгавых і сасудзістых пашкоджанняў мозга, укараніў методыку скарыстання антыгіпаксантаў.

І.І.Аляшкевіч.

І.Аляшкевіч. Групавы партрэт. 1813. Нацыянальны мастацкі музей Беларусі.

*Тв.*:Травматические субдуральные гематомы. Мн., 1980 (разам з Н.І.Рожанцам); Нейрохирургия: Операции на головном мозге. Мн., 1993 (разам з А.Ф.Аляшкевічам).

**АМАГА́САКІ**, горад у Японіі, буйны прамысл. прыгарад г. Осака, на Пд в-ва

Хонсю. 509 тыс. ж. (1995). Порт на Унутраным Японскім моры. Металургія, маш.-буд., хім., цэментавая, тэкст., шкляна-керамічная, авіяц. прам-сць.

**АМА́ДУ** (Amado) Жоржы (н. 10.8.1912, г. Ільеус, штат Баія, Бразілія), бразільскі пісьменнік. Чл. Бразільскай акадэміі (1961). Вучыўся ў езуіцкім каледжы (1922—24), ун-це ў Рыо-дэ-Жанейра. Першы раман «Краіна карнавалу» (1932). Аўтар сац.-рэв. твораў «Какава» (1933), «Мёртвае мора» (1936), «Бяскрайнія землі» (1943), «Сан-Жоржы дос Ільеус» (1944), «Падполле свабоды» (1952). Вядомасць прынеслі раманы «Незвычайная смерць Кінкаса Згінь Вада» (1961), «Дона Флор і яе два мужы» (1966), «Крама цудаў» (1969), «Тэрэза Батыста, якая стамілася ваяваць» (1972), «Вяртанне блуднай дачкі» (1976), «Знікненне святой» (1988). Творчасць А. звязана з развіццём магічнага рэалізму — спецыфічнай лац.-амер. літ. з'явы; яго творам уласцівыя зварот да фальклору, гратэскавае адлюстраванне рэчаіснасці, карнавалізацыя, змяшэнне камічнага і трагічнага. Многія з іх экранізаваны. Чл. Сусв. Савета Міру.

*Тв.:* Собр. соч. Т. 1—3. М., 1986—87.

*П.П.Акулаў.*

**АМАДЫ́ЕС** (Amadeus Lake), бяссцёкавае салёнае возера ў цэнтр. пустыннай ч. Аўстраліі. Займае падоўжаную ўпадзіну паміж гарамі Мак-Донел і Масгрэйв, на выш. 204 м. Перасыхае, пл. змяняецца па сезонах і гадах, найбольшая 8700 км$^2$. Рэштка больш буйнога ў мінулым вадаёма.

**АМАЗАНІ́Т** (ад назвы р. Амазонка, дзе ўпершыню знойдзены), мінерал, разнавіднасць *мікракліну*, афарбаваная іонамі свінцу. Крышталізуецца ў трыклінінай сінганіі. Утварае крышталі, часцей зярністыя масы з альбітам, кварцам і інш. Колер блакітнавата-зялёны, бірузовы ці ярка-зялёны. Цв. 6—6,5. Шчыльн. больш за 2,5 г/см$^3$. Трапляецца ў гранітах і гранітных пегматытах. Вырабны камень. Амазанітавыя граніты выкарыстоўваюцца як аблiцовачны матэрыял.

**АМАЗО́НАС** (Amazonas), штат на ПнЗ Бразіліі, у Амазонскай нізіне. Пл. 1564,4 тыс. км$^2$. Нас. 2200 тыс. чал. (1990). Адм. цэнтр — г. Манаус. У экватарыяльных лясах збор соку гевеі. На плантацыях вырошчваюць джут і перац.

**АМАЗО́НКА** (Amazonas), рака ў Паўд. Амерыцы, пераважна ў Бразіліі, найбольшая ў свеце па памерах басейна і воднасці і другая па даўжыні. Утвараецца ад зліцця рэк Мараньён і Укаялі. Даўж. ад вытоку р. Мараньён 6400 км, ад вытоку Укаялі больш за 7000 км. Пл. бас. 7180 тыс. км$^2$. Б.ч. басейна А. ў межах Амазонскай нізіны. Пачынаецца ў Андах, упадае ў Атлантычны ак., утварае самую вял. ў свеце ўнутраную дэльту (больш за 100 тыс. км$^2$) і лейкападобнае вусце. Больш за 500 прытокаў, сярод іх каля 20 даўжынёй больш за 1500 км. Найб. справа — Журуа, Пурус, Мадэйра, Тапажос, Шынгу, Такантынс (упадае ва ўсх. рукаў дэльты А. — Пару), злева — Жапура, Рыу-Негру (прыток Касік'ярэ злучае бас. А. з р. Арынока — найб. выразны прыклад *біфуркацыі рэк*). Шыр. А. ў месцы сутокаў Мараньёна і Укаялі 1,5 км, у сярэднім цячэнні да 5 км, у ніжнім 15—20 км, перад вусцем 80—150 км. Жыўленне пераважна дажджавое. Рака паўнаводная ўвесь год, макс. ўзровень у маі—ліп., мінімальны — у жн.—верасні. Сярэднегадавы расход вады ў ніжнім цячэнні каля 220 тыс. м$^3$/с, макс. — больш за 300 тыс. м$^3$/с. Сярэднегадавы сцёк каля 7000 км$^3$ (каля 15% агульнага гадавога сцёку ўсіх рэк зямнога шара). Прылівы падымаюцца ўверх па рацэ на 1400 км. А. і яе прытокі багатыя арган. рэчывамі. У водах А. — кайманы, прэснаводныя дэльфіны, ламанціны. Рыбалоўства. У А. і яе прытоках 2 тыс. відаў прэснаводных рыб, сярод якіх драпежныя піранья, электрычны вугор. А. мае значны энергет. патэнцыял. Даўжыня ўсіх водных шляхоў у бас. А. каля 25 тыс. км. Рака суднаходная на 4300 км ад вусця (да Андаў), да г. Манаус (1690 км) падымаюцца акіянскія судны. Гал. парты: Белен (Пара), Сантарэн, Обідус, Манаус (Бразілія), Ікітас (Перу).

Ж.Амаду.

Амазаніт.

Рака Амазонка.

Бітва грэкаў з амазонкамі. Фрагмент размалёўкі кратэра. Каля 460 да н.э.

**АМАЗО́НСКАЯ НІЗІ́НА**, Амазонія, найбуйнейшая на Зямлі нізіна ў Паўд. Амерыцы, у бас. р. *Амазонка*, пераважна ў Бразіліі, а таксама ў Калумбіі, Эквадоры, Перу. Пл. больш за 5 млн. км$^2$. Слаба заселеная. Распасціраецца з З на У на 3200 км ад Андаў да Атлантычнага ак. паміж Гвіянскім і Бразільскім пласкагор'ямі. Размешчана ў вобласці тэктанічнага прагіну (Амазонская сінекліза) Паўд.-Амерыканскай платформы, запоўненага ў асн. палеазойскімі марскімі і меза-кайназойскімі кантынент. адкладамі. Пераважае плоскі рэльеф пластавых раўнін з неглыбокімі шырокімі рачнымі далінамі. Карысныя выкапні: нафта, марганцавыя і жал. руды, золата, алмазы і інш. Клімат экватарыяльны, гарачы і вільготны, сярэднія т-ры 24—28 °С, ападкаў 1500—3000 мм за год. Рачная сетка густая, рэкі паўнаводныя. Разнастайная расліннасць вільготных экватарыяльных лясоў (сельвас) уключае 80 тыс. відаў дрэў (шмат каштоўных парод). Жывёльны свет разнастайны — 3 тыс. відаў сухапутных пазваночных (малпы, ляніўцы, малы мураўед, браняносцы, тапіры, пекары і інш.). Шмат птушак, паўзуноў, грызуноў, земнаводных, рыб (2 тыс. прэснаводных відаў), тэрмітаў,

мурашак. Праз трапічныя лясы пракладзена *Трансамазонская шаша* (1970-я г.).

**АМАЛАДЖЭ́ННЕ**, 1) набыццё арганізмам, які старэе, прыкмет маладосці; працэс процілеглы *старэнню*. Першая навук. канцэпцыя А. належыць франц. вучонаму Ш.Э.Броўн-Секару (1889), які меркаваў, што прычына старэння — аслабленне палавой актыўнасці, а амаладжальны сродак — экстракт палавых залоз жывёл. Амаладжальныя ўласцівасці ў розны час прыпісваліся балгарскай сыраквашы, антырэтыкулярнай цытатаксічнай сываратцы, гармонам, навакаіну і інш. Па сучасных уяўленнях А. складанага шматклетачнага арганізма немагчыма з прычыны незваротнасці фаз *антагенезу* (дзяцінства, маладосць, сталасць, старасць). Можна гаварыць пра запаволенае старэнне, карэкцыю ўзроставых змен, працягласць жыцця, але не пра А. ў поўным сэнсе гэтага слова. 2) Павелічэнне маладых асобін у складзе папуляцыі або ўзмоцненае размнажэнне клетак шматклетачнага арганізма.

**АМАЛО́Н**, рака, правы прыток Калымы, у Магаданскай вобл. і Рэспубліцы Саха (Якуція) Расійскай Федэрацыі. Даўж. 1114 км. Пл. бас. 113 тыс. км$^2$. Пачынаецца на Калымскім нагор'і, цячэ ў вузкай горнай даліне. Пасля ўпадзення р. Кегалі даліна расшыраецца, рака разбіваецца на рукавы. Асн. прытокі: Малангда, Алой, Алайчан (справа); Кедон (злева). Замярзае ў кастр., крыгалом у канцы мая — пач. чэрвеня. У вярхоўях перамярзае, утвараюцца наледзі. Сярэдні расход вады ў верхнім цячэнні 33,7 м$^3$/с. У ніжнім цячэнні сплаўная. Суднаходная на 595 км ад вусця.

**АМАЛЬГА́МА** (франц. amalgame ад грэч. malagma мяккая падкладка), сплаў ртуці з інш. металам. У залежнасці ад суадносін ртуці і металу падзяляюцца на вадкія і цвёрдыя. Цвёрдыя пры награванні раскладаюцца на зыходныя кампаненты, вадкія застаюцца ўстойлівымі ў вял. інтэрвале тэмператур. Інертныя да агрэсіўных асяроддзяў, маюць добрыя цеплафіз. ўласцівасці. Утварэнне А. адбываецца пры змочванні і дыфузіі ртуці ў метал. Кампаненты А. ўтвараюць інтэрметал. злучэнні — меркурыды. Золата, серабро, волава лёгка сплаўляюцца з ртуццю, медзь — у здробненым стане ці пры награванні. А. — прамежкавыя рэчывы пры здабычы высакародных металаў з рудаў і канцэнтратаў; метад іх атрымання — *амальгамацыя*.

**АМАЛЬГАМА́ЦЫЯ** ў металургіі, спосаб атрымання металаў з рудаў з дапамогай ртуці. Пры змочванні ртуццю металы ўтвараюць *амальгамы* і ў такім выглядзе аддзяляюцца ад пустой пароды і пяску. А. выкарыстоўваюць для выдзялення высакародных металаў (пераважна золата) са здробненых рудаў ці канцэнтратаў (у спалучэнні з тэхнічна больш дасканалымі працэсамі, напр. *цыянаваннем*), перапрацоўкі адходаў лёгкіх металаў (у другаснай металургіі), электралітычнага атрымання рэдкіх металаў (індыю, галію і інш.).

Амальгамы пасля насычэння металам адмываюць, фільтруюць, адціскаюць і награваюць да 800—850 °С, выдаляюць ртуць. Атрыманы «чарнавы» метал ідзе на *афінаж*, ртуць вяртаюць на А. Пры неабходнасці А. актывуюць растворамі сернай к-ты ці вапны, выкарыстоўваюць таксама ртуць з дамешкамі натрыю ці цынку. Спосабам А. выдзяляюць з руды 50—70% золата.

**АМАЛЬГА́ЦЫЯ БА́НКАЎ**, зліццё двух ці некалькіх самастойных банкаў у працэсе канкурэнтнай барацьбы; адна з формаў цэнтралізацыі банкаўскага капіталу. Адбываецца пры паглынанні адным буйным банкам другога ці стварэнні новага банка ў выніку зліцця банкаў.

Каўчуканосы Амазонскай нізіны.

**АМА́ЛЬДЗІ** (Amaldi) Эдаарда (н. 5.9.1908, каля г. П'ячэнца, Італія), італьянскі фізік. Чл. Нац. акадэміі дэі Лінчэі ў Рыме (1948), замежны чл. АН СССР (1958). Скончыў Рымскі ун-т (1929). З 1945 прэзідэнт Нац. к-та па ядз. даследаваннях Італіі, з 1948 дырэктар Нац. ін-та ядз. фізікі. У 1957—60 прэзідэнт Міжнар. Саюза чыстай і прыкладной фізікі. Навук. працы па ядз. спектраскапіі, фізіцы элементарных часціц. У 1934 сумесна з Э.Фермі і інш. адкрыў з'яву запавольвання нейтронаў у рэчывах, якія маюць у сабе вадарод. Прадказаў існаванне антыпратона (1955), у сааўт. адкрыў анты-сігма-плюс-гіперон (1960).

**АМАЛЬТЭ́Я**, найбліжэйшы спадарожнік планеты *Юпітэр*. Сярэдняя адлегласць ад планеты 181 тыс. км, перыяд абарачэння 0,498 сут, радыус 80 км. Арбіта А. ляжыць у плоскасці экватара планеты. Адкрыў Э.Барнард (1892, ЗША).

**АМА́Н**, Султанат Аман, дзяржава на Б. Усходзе, займае паўд.-ўсх. ч. Аравійскага п-ва. Тэр. дзяржавы выцягнутая з ПдЗ на ПнУ на 940 км. Абмываецца водамі Аравійскага м. Мяжуе з Емэнам, Саудаўскай Аравіяй і Аб'яднанымі Арабскімі Эміратамі; граніцы на З праходзяць па пустыні і выразна не акрэслены. Абсалютная манархія. У адм. адносінах падзяляецца на 6 раёнаў і 59 губернатарстваў. Пл. 212,4 тыс. км$^2$. Нас. 1,9 млн. чал. (1994). Афіц. мова арабская, дзярж. рэлігія іслам. Сталіца — г. *Маскат*. Нац. свята — Дзень нараджэння султана Кабуса (18 ліст.).

**Прырода.** Тэр. А. займае ўскраіну плато Аравійскага п-ва з гарамі Хаджар (найвыш. пункт краіны г. Шам, 3353 м) на ПнУ. На ПдЗ плато Дафар з гарамі Кара. Уздоўж Аманскага заліва вузкая (40—50 км) прыбярэжная нізіна Эль-Батына. У цэнтры — усх. ўскраіна пустыні Руб-эль-Халі. Карысныя выкапні: нафта (запасы 575 млн. т), прыродны газ (283 млрд. м$^3$), медная (20 млн. т) і хромавая (2 млн. т) руды; ёсць каменны вугаль, вапняк, мармур, падземныя воды, невял. запасы свінцу, золата, серабра. Клімат трапічны, гарачы і сухі. Сярэдняя т-ра паветра ў студз. каля 21 °С, у ліп. 32 °С. Ападкаў на раўнінах каля 125 мм, у гарах да 500 мм за год, выпадаюць пераважна летам. Пастаянных рэк няма, ёсць вадзі. Пераважае пустынная і паўпустынная расліннасць, у гарах участкі саваннаў, лістападных трапічных лясоў. У аазісах фінікавыя і какосавыя пальмы, аліўкавыя дрэвы. Сярод жывёл — газелі, ліс, шакал, зайцы, тушканчыкі, яшчаркі, змеі.

**Насельніцтва.** Больш як 90% арабы, жывуць таксама персы, індусы, выхадцы з Усх. Афрыкі. Большая палавіна насельніцтва аселая, сканцэнтравана ў Эль-Батына і вакол Маската, ва ўнутр. раёнах і на ПдЗ — качавое і паўкачавое. Шчыльнасць 8,9 чал. на 1 км$^2$. Пераважае сельскае насельніцтва (каля 89%). Найб. гарады: Маскат, Эль-Матрах, Эс-Сахар, Назва, Салала.

**Гісторыя.** Ёсць звесткі, што ў 4—3-м тыс. да н.э. насельніцтва на тэр. А. мела флот і займалася пасрэдніцтвам у гандлі паміж краінамі бас. рэк Ніл, Тыгр, Еўфрат і Інд. У 7—11 ст. тэр. А. некалькі разоў уключалася ў склад Арабскага халіфата. У сярэдзіне 8 ст. аманскія плямёны аб'ядналіся вакол імама, якому належала духоўная і свецкая ўлада. Незалежны імамат А. з перапынкамі існаваў да канца 18 ст. У пач. 16 ст. прыбярэжнай ч. А. завалодалі партугальцы, у 1730-я г. заваявалі персы. З 2-й пал. 18 ст. А. — аб'ект барацьбы паміж Англіяй, Францыяй і *вахабітамі*. На пач. 19 ст. кантроль над паўд.-ўсх. ч. Аравійскага п-ва ўстанавіла Англія. Тэр. А. была падзелена на імамат А., султанат Маскат і т.зв. Піратскі бераг (з 1853 *Аман Дагаворны*). У 1891 над Маскатам устаноўлены брыт. пратэктарат. Імамат А. заставаўся незалежны. Яго кіраўнікі выступалі за ліквідацыю залежнасці Маската ад Англіі і ўз'яднанне краіны, што прывяло да ўзбр. канфлікту паміж абодвума бакамі. Паводле Сібскага дагавора 1920 англ.

ўлады і султан Маската прызналі імамат А незалежнай дзяржавай. У 1955, парушыўшы дагавор, англа-маскацкія войскі ўвайшлі на тэр. А. і да 1959 акупіравалі большую яго частку; правіцелем А. стаў султан Маската Саід бен Тэймур. У выніку дзярж. пераварота з ліп. 1970 на чале А. стаў султан Кабус бен Саід. Са жн. 1970 краіна мае назву Султанат Аман. У вер. 1971 А. прыняты ў Лігу арабскіх краін, у кастр. — у ААН. Супрацоўнічае з ЗША, падтрымлівае цесныя сувязі з Вялікабрытаніяй. А. быў пасрэднікам ва ўрэгуляванні ірана-іракскай вайны 1980—88, з'яўляецца прыхільнікам стварэння бяз'ядзерных зон у розных ч. свету. Выступае за захаванне на сучасным этапе замежных войскаў у Персідскім заліве. Мае пагадненне з ЗША аб ваен. супрацоўніцтве.

**Гаспадарка.** Аснова эканомікі — здабыча (38 млн. т., 1993) і экспарт (праз порт Міна-эль-Фахль каля Маската) нафты; дае каля 70% валавога ўнутр. прадукту (у 1992 ацэньваўся ў 10,4 млрд. амер. дол., штогадовы прырост да 13%) і больш за 90% паступленняў цвёрдай валюты. Гадавая магутнасць нафтаперапр. з-даў 3 млн. т. Разведку і здабычу нафты ажыццяўляюць змешаныя кампаніі (60% капіталаў ва ўрада А., 40% у зах.-еўрап. фірмаў). Прыродны газ (гадавая здабыча 2,8 млрд. м$^3$) выкарыстоўваецца ў энергетыцы, працуюць з-ды па звадкаванні газу. Ёсць дзярж. прадпрыемствы: медзеплавільны з-д у г. Эс-Сахар, нафтаперапрацоўчы ў Маскаце, цэментны ў Русаі. Развіты рыбалоўства, буд. прам-сць, саматужныя промыслы (апрацоўка скур, прадзенне, ткацтва, выт-сць ювелірных вырабаў, халоднай зброі, прадметаў хатняга ўжытку, перапрацоўка фінікаў). Сельская гаспадарка дае 3% валавога ўнутр. прадукту (у ёй занята 42% насельніцтва, разам з рыбалоўствам). Для земляробства прыдатныя 0,2% плошчы краіны, 4,7% пад пашай. Найб. асвоены Эль-Батына, прыбярэжная раўніна Дафара і вадзі ўнутр. раёнаў. Земляробства аазіснае, са штучным арашэннем. Гал. культура — фінікавая пальма (50% апрацаваных зямель). Вырошчваюць проса, кукурузу, ячмень, пшаніцу, траву альфу (ідзе на выраб паперы і тканін), гародніну, тытунь, лімоны, апельсіны, манга, бананы, вінаград, какосавыя арэхі. Увозіцца збожжа. Жывёлагадоўля экстэнсіўная. Бедуіны-качэўнікі гадуюць авечак, козаў, вярблюдаў. Асн. транспарт — марскі і аўтамабільны, сувязь з унутр. раёнамі — па караванных шляхах. Асн. парты Міна-Кабус, Райсут, Маскат, Эль-Матрах. Аўтамагістралі злучаюць А. з Аб'яднанымі Арабскімі Эміратамі. Даўж. аўтадарог каля 23 тыс. км, нафтаправодаў 800 км, газаправодаў 350 км. Міжнар. аэрапорты ў Эс-Сіб (прыгарад Маската) і Салале. Экспарт (4,9 млрд. амер. дол., 1991) — пераважна нафта, імпарт (3 млрд. амер. дол., 1991) — машыны і трансп. сродкі, змазачныя матэрыялы, прадукты харчавання. Буйнейшыя гандл. партнёры: Вялікабрытанія, ЗША, Японія, ААЭ, Паўд. Карэя, Сінгапур. Грашовая адзінка — аманскі рыял.

*М.С.Вайтовіч* (прырода, гаспадарка), *У.С.Кошалеў* (гісторыя).

Герб і сцяг Амана.

Да арт. **Аман.** Вароты г. Маскат.

**АМА́Н**, горад, сталіца *Іарданіі*, у вадзі Зерка, на ПнЗ краіны. 1,3 млн. ж. (1990). Трансп. вузел. Міжнар. аэрапорт. Нафтаперапр., харч., тытунёвая, тэкст., цэментная і інш. прам-сць. Ун-т.

У старажытнасці вядомы пад назвай Рабат-Амон, у эліністычна-рым. эпоху — Філадэльфія. У 7—9 ст. уваходзіў у араб. *Халіфат*, пасля яго распаду ў 10 ст. — у склад розных дзяржаў Егіпта і Сірыі. З 1516 да канца 1-й сусв. вайны ў складзе *Асманскай імперыі*. З 1921 сталіца эмірата Трансіарданія, з 1946 Іарданіі. На месцы стараж. горада захавалася некалькі грабніц і фрагменты сцяны (магчыма, 9 або 8 ст. да н.э.), руіны араб. цытадэлі і рым. тэатра на 4 тыс. чал. (2 ст. н.э.), адэона (тэатр для спевакоў), німфея (ант. свяцілішча). У канцы 19 ст. пабудаваны палацы Басман і Рагдан, у 1924 — мячэць аль-Хусейн, у 1952 — маўзалей караля Абдалаха. Сучасная архітэктура горада еўрап. тыпу. Музеі: Іарданскі археалагічны, ісламу.

**АМА́Н** (Aman) Тэадор (20.3.1831, г. Кымпулунг — 19.8.1891), румынскі жывапісец і графік. Вучыўся ў Францыі (1850—58). Заснавальнік і дырэктар Школы прыгожых мастацтваў у Бухарэсце (1864). Удзельнік рэв. 1848—49 у Валахіі. Аўтар гіст. палотнаў, прасякнутых нац.-вызв. ідэямі («Выгнанне туркаў пры Кэлугэрэні», 1872), парадных партрэтаў («Тудор Уладзімірэску»), пейзажаў, гравюр на тэмы з сял. жыцця («Селянін з шапкай у руцэ», 1875).

**АМА́Н ДАГАВО́РНЫ**, назва былога брыт. пратэктарата на Аравійскім п-ве. З 1971 незалежная дзяржава *Аб'яднаныя Арабскія Эміраты*.

**АМАНА́ЛЫ**, група выбуховых рэчываў; разнавіднасць *аманітаў*. Асн. кампаненты: аміячная салетра, нітразлучэнні, дысперсны алюміній, які рэзка павышае энергію выбуху і фугаснае дзеянне. Выкарыстоўваюцца для ўзрывання парод павышанай трываласці ў вільготных і абводненых свідравінах.

**АМАНГЕЛЬДЫ́ ІМА́НАЎ** (1873, Тургайская вобл., Казахстан — 18.5.1919), адзін з кіраўнікоў нац.-вызв. паўстання ў Казахстане ў 1916. У час *Сярэднеазіяцкага паўстання 1916* узначаліў атрады ў Тургайскім і суседніх паветах. У кастр. 1917 стварыў партыз. атрад, які выступіў супраць урада, сфарміраванага партыяй *Алаш*. Адзін з арганізатараў сав. улады ў Тургайскай вобл., першых у Казахстане часцей Чырв. Арміі. Загінуў у выніку антысав. мяцяжу.

**АМА́НІ**, назва залатых манет Афганістана, якія выпускаліся ад эпохі феадалізму да 1925 (вартасць 5, 2, 1 і 1/2 А.). Агульная маса 4,6 г, чыстага золата 4,1 г. Складала 30 рупій.

**АМАНІМА́ЦЫЯ**, *стылістычная фігура* ў паэтыцы, спалучэнне слоў з аднолькавым коранем, але неаднолькавых паводле граматычнай катэгорыі. Прыклад выкарыстання А., падпарадкаванай маст. задуме, у вершы Я.Купалы «У ку-

пальскую ноч»: «Цемра з нетрай **скача скокі**...», «Так шукае, **лазіць лазам**...», «Кветкі **пільна** я **пільную**» // На **замкоў замкнёна** сорак...».

**АМАНІМІ́Я** (ад грэч. homōnymia аднайменнасць), гукавое супадзенне адзінак (марфем, слоў, словазлучэнняў), якія адрозніваюцца паміж сабой значэннем. Усе амонімы-словы падзяляюцца на тыпы: л е к с і ч н ы я (маюць поўнае гукавое супадзенне ва ўсіх формах і адносяцца да адной часціны мовы, напр., «нота» — 'дыпламатычны дакумент' і «нота» — 'муз. знак'), ф а н е т ы ч н ы я — *амафоны*, м а р ф а л а г і ч н ы я — *амаформы*. Адрозніваюць поўную і частковую А.

Поўныя лексічныя амонімы супадаюць ва ўсіх граматычных формах («заранка» — 'зорка' і «заранка» — 'ігрушка'), пры частковай А. адно са слоў цалкам (ва ўсіх формах) супадае па гучанні з часткай формаў інш. слова ці з адной яго формай («вечарам» — прыслоўе і «вечарам» — назоўнік мужч. роду адз. л. творнага склону). Да частковай адносяць прыставачную А. («дапісаць» — 'поўнасцю скончыць пісаць' і «дапісаць» — 'запоўніць старонку'), супадзенне формаў аднаго з трыванняў розных дзеясловаў («прамакаць» ад «прамакнуць» і ад «прамокнуць») і г.д. Амонімы ўзнікаюць у мове ў выніку страты сэнсавай сувязі паміж асобнымі значэннямі (у т.л. пераноснымі) многазначных слоў («каса» — 'прылада працы', «каса» — 'заплеценыя валасы', «каса» — 'вузкая пясчаная паласа'), у выніку дзеяння фанет. законаў мовы (аглушэння зычных на канцы слова: «мох» — 'расліна' і «мог» — ад дзеяслова «магчы»), гукавога супадзення розных слоў («міна» — 'выраз твару' і «міна» — 'снарад з выбуховым рэчывам') і інш. Ад амонімаў трэба адрозніваць *амографы*.

*Л.П.Кунцэвіч, А.Я.Міхнеў.*

**АМАНІ́ТЫ**, а м о н а і д э і (Ammonoidea), надатрад вымерлых малюскаў кл. галаваногіх. Былі пашыраны ў дэвонскім і мелавым перыядах, дасягнулі росквіту ў сярэдзіне мезазойскай эры. Вядома каля 1,5 тыс. родаў і 5 тыс. відаў. Рэшткі А. трапляюцца ўсюды ў марскіх адкладах. На Беларусі найб. поўна фауна А. прадстаўлена ў Прыпяцкім прагіне ў адкладах верхнеюрскай сістэмы.

Ракавіны 1 см — 2 м у папярочніку. Падзяляліся перагародкамі на самастойныя камеры, у адной з якіх размяшчалася цела. Астатнія былі запоўнены газам і злучаліся паміж сабою тонкім вырастам мяккага цела (сіфонам), які служыў рэгулятарам газавага ціску ў камерах. На галаве шчупальцы. Маглі жыць у бурнай прыбярэжнай паласе. Драпежнікі. Маюць стратыграфічнае значэнне.

**АМАНІ́ТЫ**, сумесевыя выбуховыя рэчывы брызантнага дзеяння, у састаў якіх як акісляльнік уваходзіць аміячная салетра $NH_4NO_3$. Паводле тыпу гаручага кампанента падзяляюцца на ўласна А. — сумесі $NH_4NO_3$ з выбуховымі нітразлучэннямі (трынітраталуол, дынітранафталін і інш.) і *дынамоны* — сумесі з невыбуховым гаручым (торфам, драўніннай мукой, тэхн. маслам, парашком металаў). Біпарныя сумесі $NH_4NO_3$ з трынітраталуолам наз. аматоламі, А. з дамешкамі алюмінію — *аманаламі*. У якасці сенсібілізатараў дэтанацыі ўводзяць магутныя выбуховыя рэчывы (нітрагліцэрын, гексаген і інш.), для надання водаўстойлівасці і стабільнасці — спец. дабаўкі (мел, даламіт, крухмал, стэараты некаторых металаў). Выпускаюцца ў выглядзе парашкоў і гранул. Асобная група — воданапоўненыя А., змяшчаюць насычаны водны раствор $NH_4NO_3$, які ператвараецца ў гель (*акватолы, акваніты*). А. малаадчувальныя да мех. уздзеянняў, адносна бяспечныя пры вытв-сці, захоўванні і выкарыстанні.

**АМАНІФІКА́ЦЫЯ** (ад *амоній* + лац. facio раблю), працэс раскладання мікраарганізмамі арган. азоцістых рэчываў глебы з вылучэннем аміяку. Мае вял. значэнне ў кругавароце азоту ў прыродзе і жыўленні раслін. У А. ўдзельнічаюць гніласныя бактэрыі,

Аманіт.

актынаміцэты, плесневыя грыбы. А. падвяргаюцца рэшткі раслін, жывёл, якія загінулі, гумус, арган. ўгнаенні і інш. Аміяк, што выдзяляецца пры А., часткова выкарыстоўваецца мікраарганізмамі ў сінтэзе бялкоў уласных клетак. Большая колькасць яго ператвараецца ў глебе ў аманійныя солі, якія засвойваюцца раслінамі, частка акісляецца да нітратаў (гл. *Нітрыфікацыя*). Лепш працякае ў слабакіслых і нейтральных, дастаткова ўвільготненых глебах, што добра аэрыруюцца.

**АМАНО́ЛІЗ**, абменная хім. рэакцыя паміж рэчывам і *аміякам*. Напр., пры атрыманні амінаў з галагенвытворных вуглевадародаў: $RHal + 2NH_3 \rightarrow RNH_2 + NH_4Hal$. Адбываецца як тыповая сальватычная рэакцыя (гл. *Сальволіз*), на ўзор нуклеафільнага замяшчэння.

**АМА́НСКІ ЗАЛІ́Ў**, на ПнЗ Аравійскага м., злучаны Армузскім пралівам з Персідскім залівам. Пл. 112 тыс. км². Даўж. каля 450 км, шыр. 330 км. Глыб. 3694 м. Выш. прыліваў да 2 м. Порт — г. Маскат (Аман).

**АМА́НСКІЯ ГО́РЫ**, гл. *Хаджар*.

**АМАНУЛА́-ХАН** (1.6.1892 — 25.4.1960), кароль Афганістана ў 1919—29. 28.2.1919 абвясціў незалежнасць Афганістана і ўзначаліў вызв. барацьбу супраць Вялікабрытаніі. У 1921 заключыў з РСФСР дагавор аб дружбе, у 1926 — з СССР дагавор аб нейтралітэце і ўзаемным ненападзенні. Праведзеныя ім рэформы спрыялі цэнтралізацыі краіны, развіццю нац. эканомікі і культуры, умацаванню незалежнасці дзяржавы. У выніку антыўрадавага паўстання 1928—29 быў вымушаны пакінуць краіну. Памёр у Цюрыху.

**АМАПА́** (Amapá), федэральная тэрыторыя на Пн Бразіліі. Пл. 140,3 тыс. км². Нас. 268 тыс. чал. (1990). Адм. цэнтр — г. Макапа. Буйныя запасы марганцавых рудаў.

**АМА́Р І**, А м а р і б н а л ь - Х а т а б (каля 591 ці 581, Мекка — 3 ці 4.11.644), другі халіф (з 634) у Арабскім халіфаце, адзін з бліжэйшых паплечнікаў *Мухамеда*. Пры А. І араб. войскі атрымалі перамогі над візантыйцамі і *Сасанідамі*, заваявалі значныя тэр. ў Азіі і Афрыцы (гл. *Арабскія завяванні*). Увёў мусульманскае летазлічэнне паводле хіджры. Забіты рабом-персам.

**АМА́РА**, горад на ПдУ Ірака, адм. ц. мухафазы Майсан. 130 тыс. ж. (1985). Вузел шашэйных дарог. Перапрацоўка с.-г. прадукцыі (рыс, фінікі); цукр. завод. Паблізу А. — цэлюлозна-папяровы камбінат.

**АМАРАЛІ́ЗМ** (ад *а*... + лац. moralis маральны), адмаўленне маральных асноў грамадства, ігнараванне агульнапрынятых нормаў паводзін. Да А. можна аднесці *цынізм*, крайні *нігілізм*, адкрыты *эгаізм*, чалавеканенавісніцтва. Праяўленні А. могуць спараджацца сац. прычынамі, маральна-псіхал. неразвітасцю індывіда. У свядомасці і паводзінах людзей А. больш пашыраецца ў перыяды сац. крызісаў. *В.А.Паўлоўская.*

**АМАРА́НТ**, гл. *Аксамітнік*.

**АМА́РНА**, Э л ь - А м а р н а, паселішча ў Егіпце на ўсх. беразе Ніла, за 312 км на Пд ад Каіра. Каля А. знаходзяцца руіны стараж. горада Ахетатона. Гл. *Тэль эль-Амарна*.

**АМАРТЫЗА́ТАР**, прыстасаванне для аховы канструкцый машын і збудаванняў ад удараў і дынамічных нагрузак. Змяшчаецца паміж целам, якое ўспрымае і перадае ўдарную нагрузку, і целам, што засцерагаецца ад яе ўздзеяння (напр., паміж заднім мостам і кузавам аўтамабіля). У А. выкарыстоўваюцца пругкія ўласцівасці цвёрдых целаў (гумавых элементаў, рысораў, тарсіёнаў), гідраўлічных спружын і газаў. Устанаўліваюцца ў сукупнасці з *дэмпферам* (часта ў адным блоку). Асн. тыпы А.: спружынны, гумавы, фрыкцыйны, пнеўматычны, гідраўлічны, гідрапнеў-

матычны (спалучае асаблівасці гідраўл. і пнеўматычнага А.).

**АМАРТЫЗА́ЦЫЯ** (ад позналац. amortisatio пагашэнне), паступовы перанос кошту *асноўных вытворчых фондаў* на кошт атрыманай на гэтых фондах гатовай прадукцыі. Абумоўлена неабходнасцю кампенсацыі зносу фондаў і забеспячэння поўнай іх замены пры выбыцці з вытв-сці. На гэта робяцца амартызацыйныя адлічэнні — уключэнне часткі кошту асн. фондаў у сабекошт прадукцыі. Яны вызначаюцца пераважна як працэнт (норма А.) ад кошту асн. фондаў і налічваюцца на працягу амартызацыйнага перыяду. Такія адлічэнні паступова назапашваюцца на рахунках прадпрыемства і разам з прыбыткам з'яўляюцца крыніцай фонду для набыцця новых машын, абсталявання, павышэння тэхн. ўзроўню вытв-сці, каб забяспечыць канкурэнтаздольнасць прадукцыі і прадпрыемства. Нарматывы А. і метады яе налічэння зацвярджаюцца органамі дзярж. кіравання. У якасці нарматываў выкарыстоўваюцца норма А. і патонная стаўка. Норма А. — цэнтралізавана ўстаноўлены гадавы працэнт пагашэння кошту асн. фондаў ва ўсіх галінах нар. гаспадаркі і практычна для ўсіх відаў асн. фондаў. Залежыць ад нарматыўнага тэрміну службы асн. фондаў: чым ён карацейшы, тым большая норма А. У здабыўных галінах тэрмін службы некаторых асн. фондаў (спецыялізаваныя будынкі, горныя выпрацоўкі і інш.) вызначаецца не фізічным зносам, а памерамі запасаў карысных выкапняў. Для гэтых відаў асн. фондаў у якасці нарматыву А. выкарыстоўваецца патонная стаўка — велічыня кошту асн. фондаў у разліку на 1 т запасаў карысных выкапняў. Гадавыя амартызацыйныя адлічэнні пры гэтым вызначаюцца як здабытак патоннай стаўкі на гадавы аб'ём здабычы карысных выкапняў.

У залежнасці ад метадаў налічэння адрозніваюць раўнамерную, паскоranую і ўзрастаючую А. Пры раўнамернай А. кошт асн. фондаў пераносіцца на сабекошт прадукцыі роўнымі часткамі на працягу ўсяго амартызацыйнага перыяду, што не адпавядае дынаміцы фізічнага і маральнага зносу асн. фондаў, не забяспечвае своечасовае фарміраванне фін. сродкаў прадпрыемства для абнаўлення тэхнікі. Пры паскоranай А. ў першы год службы асн. фондаў на сабекошт прадукцыі пераносіцца найб. частка іх кошту. Пры ўзрастаючай А. сума амартызацыйных адлічэнняў штогод павялічваецца і дасягае макс. велічыні ў апошні год амартызацыйнага перыяду. Гэта стымулюе замену старой тэхнікі на новую, таму што к канцу амартызацыйнага перыяду яе эксплуатацыя становіцца не эфектыўнай.

Адносіны дзяржавы да А. характарызуюць яе адносіны да навукова-тэхн. прагрэсу. Пры паскоranай (5 гадоў і менш) А. ў развітых краінах тэрміны спісання абсталявання перавышаюць тэрміны яго рэальнага зносу, што азначае падатковую субсідыю прадпрыемствам. Гэта павышае ўзровень накаплення і самафінансавання, спрыяе нарошчванню асн. капіталу ў навукаёмістых галінах, прагрэс. структурным зрухам у эканоміцы. На паскарэнне тэмпаў навукова-тэхн. прагрэсу накіраваны і інш. метады А. ў гэтых краінах: вытв. метад, метад раўнамернага прамалінейнага спісання кошту абсталявання, метад спец. А. *Л.А.Лобан.*

**АМА́РЫ** (Homaridae), сямейства дзесяціногіх марскіх ракаў. 36 відаў. Водзяцца ў Атлантычным ак. і ў злучаных з ім морах. Нагадваюць рачных ракаў, але большыя памерамі. Найб. вядомыя: еўрапейскі А. (Homarus gammarus), даўж. да 65 см, маса да 11 кг; амерыканскі А. (H. americanus), даўж. да 63 см, маса 15 кг; нарвежскі А. (Nephrops norvegicus), даўж. да 32 см, маса 7 кг.

Жывуць на скалістым, камяністым або жвірыстым грунце. Удзень хаваюцца сярод камянёў, ноччу кормяцца малюскамі і інш. беспазваночнымі. Характэрна наяўнасць магутных клюшняў на першай пары хадзільных ног, наступныя 2 пары з клюшнямі меншых памераў. Растуць павольна, жывуць да 50 га-

Амар еўрапейскі.

доў. Палавой спеласці дасягаюць на 6-м годзе. Далікатэс, аб'ект промыслу і развядзення.

**АМАРЫ́ЛІС** (Amaryllis), род кветкавых раслін сям. амарылісавых. Адзін від — А. красуня (A. belladonna) расце ў Паўд. Афрыцы (эндэмік *Капскай біягеаграфічнай вобласці*). На Беларусі вырошчваюць у пакаёвай культуры, цяпліцах і аранжарэях А. гібрыдны, атрыманы ад

Амарыліс гібрыдны.

скрыжавання А. красуні з рознымі відамі гіпеаструма.

Шматгадовая травяністая расліна з буйнымі грушападобнымі цыбулінамі. Лісце скурыстае, бліскучае, рэменепадобнае. Кветкі буйныя (да 26 см у дыям.), лейкападобныя, духмяныя, сабраныя па 2—12 на канцы доўгага (да 70 см) кветканоса ў парасонік; розных колераў (белыя, чырвоныя, ружовыя, аранжавыя, крэмавыя, іншы раз стракатыя, са штрыхамі і плямамі). Цвіце зімою, ранняй вясною. Плод — каробачка з буйным чорным насеннем. Размнажаецца цыбулінамі-дзеткамі. Святалюбны.

**АМАРЫ́М** (Amorim) Энрыке (25.7.1900, г. Сальта, Уругвай — 28.7.1960), уругвайскі пісьменнік. Літ. дзейнасць пачаў у 1920 (зб. вершаў «Дваццаць год»). Большасць твораў пра жыццё сялянства (трылогія «Арба», 1933, «Пасяленец Агіляр», 1934, «Конь і яго цень», 1941). Вострыя сац. канфлікты ўзняты ў раманах «Дзевяць месяцаў над Неўкенам» (1946), «Перамога не прыходзіць сама» (1952); у рамане «Вусце» (1958) спроба прасачыць усю гісторыю Уругвая. Аўтар паэт. зб. «Мая радзіма» (1960).

*Тв.:* Рус. пер. — Хозяин Агиляр; Тень Скакуна. М., 1987.

**АМАРЫ́ТЫ**, амарэі, амуру, галіна семіцкіх народаў, якія ў старажытнасці насялялі Сірыйскі стэп ад Палесціны да Персідскага зал. У канцы 3-га тыс. да н.э. разбурылі шумерскую цывілізацыю Ура і каля 1894 да н.э. заснавалі Старававілонскую дзяржаву. Асеўшы ў Месапатаміі, у 18—17 ст. да н.э. асімілявaліся з мясц. насельніцтвам, у Сірыі і Палесціне ў 15—10 ст. да н.э. зліліся з *ханаанеямі*. У 1-м тыс. да н.э. Сірыя наз. Амуру.

**АМА́ТАР** (лац. amator), 1) ахвотнік да чаго-н. 2) Той, хто займаецца чым-н. не як прафесіянал; любіцель.

**АМА́ТАРСКАЕ КІНО́**, кінааматарства, від самадзейнага мастацтва. Узнікла з часу вынаходніцтва кінематографа (1895). У Зах. Еўропе і ЗША пашырана з пач. 1930-х г., у б. СССР — з 1925, больш актыўна развівалася пасля 1957, калі пры Саюзе кінематаграфістаў краіны была створана Усесаюзная камісія па працы з кінааматарамі. Праводзіліся фестывалі, конкурсы А.к.

На Беларусі А.к. развіваецца з канца 1950-х г., створаны шматлікія самадз. студыі. З 1960 штогод праводзіліся абл. і рэсп. конкурсы-агляды А.к. Бел. аматары ўдзельнічалі ва ўсесаюзных і міжнар. фестывалях, іх фільмы неаднаразова адзначаліся ўзнагародамі. Росту маст. ўзроўню А.к. спрыяла секцыя па рабоце з кінааматарамі пры Саюзе кінематаграфістаў Беларусі. Асобныя кінааматары сталі прафесійнымі кінарэжысёрамі. Істотныя змены ў кінааматарскі рух унесла развіццё відэазапісу.

**А́МАТЭРАСУ**, Аматэрасу-о-мікамі, Аматэрасу-но мікота, у японскай міфалогіі і рэлігіі сінтаізму вярх. багіня, увасабленне Сонца. Паводле міфаў, А. паслала на зямлю свай-

го сына Нінігі, нашчадак якога Дзіму даў пачатак імператарскаму роду Японіі.

**АМАФО́НЫ** [ад *гама...* + *...фон*(ы)], словы, аднолькавыя паводле гучання, але розныя па напісанні і значэнні. Параўн.: «грыб — грып», «род — рот», «везці — весці», «код — кот». Амафанія — звычайна вынік супадзення ў гучанні асобных формаў слова.

В.А.Амбарцумян.

**АМАФО́РМЫ** (ад *гама...* + лац. forma форма, вонкавы выгляд, абрыс), словы, якія ў асобных граматычных формах супадаюць гучаннем і напісаннем, але не супадаюць значэннем. А. могуць быць словамі той самай або розных часцін мовы, напр., «горы» (назоўны склон мн. л. назоўніка «гара») і «горы» (месны склон адз. л. назоўніка «гора»), «кліч» (назоўнік) і «кліч» (дзеяслоў загаднага ладу), «вусны» (назоўнік) і «вусны» (прыметнік) і інш.

**АМАФО́С**, канцэнтраванае фосфарна-азотнае *мінеральнае ўгнаенне*. Атрымліваецца нейтралізацыяй фосфарнай к-ты аміякам. Мае (у %) 9—12 азоту, 35,5—50 засваяльнага пентаксіду фосфару. Высокаэфектыўнае для ўсіх с.-г. культур на любых глебах. Кампанент *тукаў*.

**АМА́ЦІ** (Amati), італьянскія майстры смычковых інструментаў. Працавалі ў Крэмоне. Андрэа (каля 1520 — каля 1580) — заснавальнік крэмонскай школы. Упершыню вызначыў падбор дрэва і стварыў класічны тып скрыпкі з яркім серабрыстым, але не моцным гучаннем. Яго сыны — Антоніо (1540 — пасля 1600) і Джыралама (1561—1680) часта працавалі разам. Іх інструменты больш вытанчанай формы. Найб. вядомы Нікала А. (3.12.1596 — 12.4.1684), сын і вучань Джыралама. Стварыў новую мадэль скрыпкі «Гранд Амаці» з дасканалымі формамі, прыгожым моцным гукам. Сярод яго вучняў — А.*Гварнеры*, А.*Страдывары*.

**АМАЦЭ́НТ**, гл. ў арт. *Пескарыйка*.

**АМАШУКЕ́ЛІ** Элгуджа Давідавіч (н. 22.8.1928, Тбілісі), грузінскі скульптар-манументаліст. Нар. мастак Грузіі (1979). Вучыўся ў Тбіліскай АМ (1950—55). Аўтар алегарычнай статуі «Мацігрузія» (дрэва, 1958; алюміній, 1963), помніка Вахтангу Гаргасалу (1967) у Тбілісі, манумента Перамогі ў Горы, мемарыяла Славы героям-маракам у Поці (абодва 1979). Дзярж. прэмія СССР 1982.

**АМБА́ЛА**, горад на Пн Індыі, штат Хар'яна. 121 тыс. ж. (1981). Трансп. вузел. Гандл. цэнтр. Бавоўнапрадзільная, мукамольная, шкляная прам-сць. Вытворчасць дакладных і хірург. інструментаў, оптыкі, навук. абсталявання.

**АМБАРЦУМЯ́Н** Віктар Амазаспавіч (н. 18.9.1908, Тбілісі), армянскі астраном і фізік; заснавальнік сав. тэарэт. астрафізікі. Акад. АН СССР (1953) і АН Арменіі (1943). Герой Сац. Працы (1968, 1978). Замежны чл. АН многіх краін. Скончыў Ленінградскі ун-т (1928). Стваральнік і дырэктар Бюраканскай астрафіз. абсерваторыі (1946). З 1947 прэзідэнт АН Арменіі. Навук. працы па фізіцы зорак і туманнасцяў, зорнай дынаміцы, пазагалактычнай астраноміі, касмагоніі, ядз. і тэарэт. фізіцы. Адкрыў і даследаваў зорныя сістэмы новага тыпу (т. зв. зорныя асацыяцыі). Дзярж. прэміі СССР 1946, 1950.

Э.Амашукелі. Помнік Вахтангу Гаргасалу. 1967.

*Тв.:* Проблемы современной космогонии. 2 изд. М., 1972 (у сааўт.).

Амбістома тыгравая.

**АМБІВАЛЕ́НТНАСЦЬ** (ад лац. ambo абодва + valentia сіла), дваістасць успрымання і перажывання, калі адзін і той жа аб'ект выклікае ў чалавека процілеглыя пачуцці і ацэнкі (задавальненне і незадаволенасць, сцвярджэнне і адмаўленне). Тэрмін «А.» увёў у 1930 швейц. псіхіятр Э.Блейлер для вызначэння супярэчлівага псіх. стану. Рас. літ.-знавец М.Бахцін надаў яму значэнне эстэт. паняцця. А. выявілася ў нар. і неафіц. культуры эпохі сярэднявечча і Адраджэння, у фальклоры, нар. мастацтве. Амбівалентныя вобразы, сюжэты і матывы характэрны для бел. і інш. архаічнай міфалогіі, сінкрэтычнай творчасці з нявыяўленай дыферэнцыяцыяй эстэт. катэгорый-апазіцый (прыгожага і агіднага, узнёслага і нізкага, трагічнага і камічнага). Амбівалентныя гратэск і сімволіка ёсць у творчасці Ф.Рабле, М.Сервантэса, М.Гогаля, Ф.Багушэвіча, Я.Купалы. У класічным мастацтве і бел. нац. фальклоры А. выкарыстоўваецца як дасціпны і шматзначны маст. сродак, спалучэнне прыкмет эпічнага героя і камічнага дублёра ў чарадзейных казках і легендах, нар. тэатры, прыказках і прымаўках, літ.-маст. травестацыях і пародыях (польска-бел. камедыі, інтэрмедыі 17—18 ст., ананімныя творы «Энеіда навыварат», «Тарас на Парнасе»). У сучасным мастацтве праяўляецца ў сатыр. жанрах (у творах А.Макаёнка, ананімнай паэме «Сказ пра Лысую гару»), цыркавой клаунадзе і інш.

*У.М.Конан.*

**АМБІЛЕ́ЎЦЫ**, вёска ў Беларусі, у Лядскім с/с Шчучынскага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр калгаса. За 10 км на Пн ад Шчучына, 59 км ад Гродна, 19 км ад чыг. ст. Ражанка. 296 ж., 101 двор (1995). Б-ка, Дом культуры, аддз. сувязі.

**АМБІСТО́МЫ** (Ambystoma), род аднайменнага сямейства, атр. хвастатых земнаводных. 21 від, у Цэнтр. і Паўн. Амерыцы. Нагадваюць саламандраў.

Даўж. да 28 см. Жывуць у вільготных мясцінах, удзень хаваюцца ў норах грызуноў. Ікру адкладваюць у ваду, мармуровая А. (*A. opacum*) — на сушы. Плоднасць да 500 яец. Лічынкі з галінастымі вонкавымі шчэлепамі развіваюцца ў вадзе. Жывяцца беспазваночнымі. Лічынка тыгравай А. — *аксалотль*.

**АМБІ́ЦЫЯ** (лац. ambitio), абвостранае самалюбства, празмернае пачуццё асабістай годнасці; славалюбства, ганарыстасць, фанабэрыя.

**АМБЛІГАНІ́Т** (ад грэч. amblys тупы + gōnia вугал), мінерал класа фасфатаў $LiAl[PO_4](FOH)$. Мае пераменную колькасць F і OH, іншы раз $H_2O$; прымесі натрыю, ванадыю. Крышталізуецца ў трыкліннай сінганіі. Крышталі рэдкія, буйныя, дрэнна ўтвораныя; бясформенныя масы, жаўлакі, зерні. Колер белы, зеленаваты, блакітны, карычневы. Паўпразрысты. Цв. 6—6,5. Шчыльн. 3—3,1 г/см³. Пашыраны ў гранітных пегматытавых жылах, альбітызаваных гранітах; каштоўная літыевая руда.

**АМБО́Н** (ад грэч. ambōn узвышэнне), казальніца, пульпіт, паўкруглае і высунутае на сярэдзіну храма ўзвышэнне перад *царскімі варотамі*, з якога чытаюць Евангелле, гавораць казанні. Сімвалізуе камень каля Труны Гасподняй, які адваліў ангел і з яго абвясціў міраносцам пра ўваскрэсенне Хрыста. А. рабілі з каменю, дрэва, металу, багата дэкарыравалі мармурам. У ранні перыяд хрысціянства ўстанаўлівалі перад алтаром каля балюстрады, што аддзяляла хоры ад нефа, і мелі форму трыбуны з парапетам; з сярэднявечча — каля левага міжнефавага ці цэнтр. слупа, у аднанефавых храмах — на сцяне. У эпоху Адраджэння А. меў пераважна акруглую ці чатырохгранную форму.

**АМБО́Н** (Ambon), Амбаіна, горад у Інданезіі, на в-ве Амбон, адм. ц. правінцыі Малуку. 209 тыс. ж. (1980). Гал. порт Малукскіх а-воў (вываз копры, спецый). Рыбалоўства. Ун-т. Даследчы цэнтр Нац. ін-та акіяналогіі.

**А́МБРА** (франц. ambre ад араб. анбар), воскападобнае духмянае рэчыва, якое выдзяляецца кішэчнікам кашалота. Бывае ад шэрага, чорнага, карычневага да залацістага і белага колераў. Зрэдку А. знаходзяць у вадзе або па берагах Індыйскага і Ціхага акіянаў.

Кавалкі А. маюць круглаватую форму, масу ад некалькіх кілаграмаў да 400 кг. Добра раствараецца ў спірце, эфіры, алеях. Выкарыстоўваюць у парфумерыі як замацавальнік пахаў духоў. Замяняюцца штучнымі замацавальнікамі.

**АМБРАЖУ́НАС** Пётр (Пятрас) Іосіфавіч (24.1.1892, в. Грумшлі Біржайскага р-на, Літва — 20.12.1937), дзярж. дзеяч БССР. З 1913 у арміі. У 1919 старшыня Мірскага валаснога ВРК, у органах па харч. забеспячэнні Смаленскай губ. і Зах. фронту. У 1921—22 мінскі павятовы харчкамісар. З 1923 старшыня Мінскага, Аршанскага павятовых, з 1928 Гомельскага акруговага выканкомаў. З 1930 нам. старшыні Вышэйшага савета нар. гаспадаркі БССР, з 1934 нарком, нам. наркома камунальнай гаспадаркі БССР. Старшыня праўлення Саюза архітэктараў БССР (1934—37). Чл. ЦВК БССР (1924—37). Канд. у чл. ЦК (1927—30), чл. ЦК КП(б)Б (1930—37). Рэпрэсіраваны. Рэабілітаваны ў 1957.

**АМБРАЗАЙЦІ́ТЭ** (Ambrazaityte) Ніёле Вінцаўна (н. 21.2.1939, в. Буракай Лаздзійскага р-на, Літва), літоўская спявачка (мецца-сапрана). Нар. арт. СССР (1977). Пасля сканчэння Вільнюскай кансерваторыі (1966) салістка Літ. т-ра оперы і балета. Спявачка высокай вак. і сцэнічнай культуры. Сярод партый: Марына Мнішак («Барыс Гадуноў» М.Мусаргскага), Кармэн («Кармэн» Ж.Бізэ), Амнерыс («Аіда» Дж.Вердзі), Мірта («Піленай» В.Кловы). Лаўрэат Міжнар. конкурсу вакалістаў імя Дж.Энеску (Бухарэст, 1970).

**АМБРАЗІЯ́НСКАЯ РЭСПУ́БЛІКА** (Republica Ambrosiana), рэспубліканскае праўленне ў г. Мілан з 14.8.1447 да 27.2.1450 (назва ад св. Амвросія, апекуна Мілана). Створана гар. вярхамі пасля смерці апошняга міланскага герцага з дынастыі Вісконці, ва ўмовах цяжкай вайны з Венецыяй. Палітыка ўрада нобіляў выклікала незадаволенасць нар. мас. У ліп. 1449 у выніку нар. паўстання створаны новы ўрад. Прэтэндэнт на герцагскі прастол Ф.Сфорца заключыў перамір'е з Венецыяй і арганізаваў асаду Мілана. Ва ўмовах галоднай блакады горад здаўся. Сфорца абвясціў сябе герцагам Мілана, і А.р. перастала існаваць.

**АМБРАЗУ́РА** (франц. embrasure), прамавугольная, арачная або круглая адтуліна ў сценах абарончага збудавання, бранявежах для вядзення агню з гармат, кулямётаў, мінамётаў, а таксама для назірання за праціўнікам. Формы і памеры А. залежаць ад віду зброі, сектара



Амбліганіт.

абстрэлу (назірання), умоў стральбы. Іншы раз для закрыцця А., калі праз яе не вядуць агонь (назіраюць), ставяць бранявую засланку. У бел. абарончым дойлідстве вядома з 16 ст. (у Гродзенскім Старым, Мірскім замках, Брэсцкай і Бабруйскай крэпасцях і інш.). Гл. таксама *Байніца*.

**АМБРО́ЗІЯ** (грэч. ambrosia), у грэчаскай міфалогіі — нектар, ежа багоў, якая забяспечвала вечную маладосць і прыгажосць.

**АМБРО́ЗІЯ** (Ambrosia), род кветкавых раслін сям. астравых. Каля 40 відаў. Пашыраны ў Паўн. і Цэнтр. Амерыцы (у іншых краінах — занесеныя). На Беларусі рэдка трапляюцца А. палынналістая (A. artemisiifolia) і трохраздзельная (A. trifida), магчымы знаходкі і інш. відаў, якія актыўна пашыраюцца ў Еўропе і з'яўляюцца каранцінным пустазеллем.

Адна- або шматгадовыя травяністыя ра-



Амбразура.

сліны, радзей паўкусты з галінастым сцяблом выш. да 2 м. Лісце супраціўнае або чаргаванае: перыстарассечанае. Кветкі малапрыкметныя, у маленькіх аднаполых кошыках, сабраных у коласападобныя суквецці (песцікавыя 2-кветныя). Плод — калючкаватая сямянка

Амбон у касцёле францысканцаў у Пінску. 18 ст.

(адна расліна можа даваць да 90 000 сямянак). Пылок з кветак выклікае алергічныя захворванні: сяннную ліхаманку, бранхіяльную астму і інш.

**АМБРО́САВІЧЫ**, вёска ў Беларусі, у Светласельскім с/с Шумілінскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса. За 15 км на Пд ад Шуміліна, 40 км ад Віцебска, 13 км ад чыг. ст. Шуміліна. 351 ж., 114 двароў (1995). Сярэдняя школа, б-ка, Дом культуры, аддз. сувязі.

**АМБРО́САЎ** Антон Лаўрэнавіч (16.6.1912, в. Дрыколле Віцебскага р-на — 6.2.1984), бел. фітапатолаг. Чл.-кар. АН Беларусі (1970). Д-р біял. н. (1967), праф. (1977). Скончыў Ленінградскі с.-г. ін-т (1936). У 1944—51 дырэктар Ганусаўскай с.-г. доследнай станцыі. З 1956 у Бел. НДІ бульбаводства і плодаагародніцтва (у 1971—78 дырэктар), з 1978 у Бел. НДІ аховы раслін. Навук. працы па пытаннях павышэння ўстойлівасці бульбы да вірусных хвароб, укараненні яе высокапрадукцыйных сартоў. Даследаваў вірусныя хваробы збожжавых, люцэрны, канюшыны, яблыні. Дзярж. прэмія СССР 1974.

*Тв.*: Вирусные болезни картофеля и меры борьбы с ними. Мн., 1975; Как защитить сад от вредителей и болезней. Мн., 1976 (разам з В.В.Балотнікавай, В.С.Мярцалавай); Физиология картофеля. М., 1979 (у сааўт.).

**АМБУЛАТО́РНА-ПАЛІКЛІНІ́ЧНАЯ ДАПАМО́ГА**, пазабальнічная медыцынская дапамога, якая аказваецца ў *амбулаторыях, паліклініках, кансультацыях, дыспансерах, медыка-санітарных частках*, фельчарска-акушэрскіх пунктах, дыягнастычных цэнтрах і інш. мед. установах (самастойных ці ў складзе бальніц). Найб. масавы, даступны і набліжаны да месца жыхарства або працы від мед. абслугоўвання і аказання першаснай медыка-сан. дапамогі насельніцтву. Асн. формы А.-п. д.: экстраная, лячэбна-дыягнастычная, лячэбна-кансультацыйная, прафілакт., рэабілітацыйная.

На Беларусі з пач. 1990-х г. пачалося фарміраванне тэр. мед. аб'яднанняў, у склад якіх уваходзяць паліклінікі (для дарослых, дзяцей, стаматалагічная), жаночыя кансультацыі, дыспансеры, мед.-сан. часткі, станцыі і аддзяленні хуткай мед. дапамогі і інш. Уводзяцца новыя арганізац. структуры — аддзяленні прафілактыкі, мед. рэабілітацыі, адзіныя акушэрска-тэрапеўтычныя і педыятрычныя комплексы, дыягнастычныя цэнтры, гасп.-разліковыя паліклінікі, касметалагічныя лячэбніцы, фізіятэрапеўт. паліклінікі, перасоўныя амбулаторыі, флюараграфічныя, стаматалагічныя і зубапратэзныя кабінеты і інш. Пашыраюцца формы прыватнага аказання А.-п.д. Больш як 1,5 тыс. ўстаноў А.-п.д. (1994) абслугоўваюць каля 80% хворых.

*Э.А.Вальчук.*

**АМБУЛАТО́РЫЯ** (ад лац. ambulatorius рухомы), лячэбна-прафілактычная ўстанова, што аказвае мед. дапамогу ў самой установе і дома. У адрозненне ад паліклінікі абслугоўвае хворых толькі па асн. трох спецыяльнасцях: тэрапіі, педыятрыі і стаматалогіі. У А. вял. населеных пунктаў працуюць таксама акушэрка-гінеколаг, хірург, неўрапатолаг. Пры А. можа дзейнічаць пункт неадкладнай дапамогі, дзённы стацыянар на 4—6 ложкаў. Мед. дапамога насельніцтву ажыццяўляецца па ўчастковa-тэр. прынцыпе. Існуюць А. пераважна ў невял. гарадах і сельскай мясцовасці; бываюць самастойныя, пры бальніцах і на прамысл. прадпрыемствах, перасоўныя з клініка-дыягнастычнай, флюараграфічнай, стаматалагічнай і інш. лабараторыямі. У 1994 на Беларусі дзейнічалі 364 А., дзе працавала 497 урачоў.

**АМБУ́НДУ**, мбунду (саманазва кімбунду), народ у Анголе. 2 млн. чал. (1987). Гавораць на мове групы *банту*. Прытрымліваюцца ў асноўным традыц. культаў. Ёсць католікі і прыхільнікі сінкрэтычных культаў.

Амброзія пальналістая.

**АМВРО́СІЕЎКА**, стаянка і косцішча верхняга палеаліту (каля 25—20 тыс. г. таму назад) каля в. Амвросіеўка (Данецкая вобл., Украіна). На стаянцы, дзе жылі першабытныя паляўнічыя, выяўлены рэшткі агнішчаў, вял. колькасць апрацаванага крэменю, на косцішчы — касцявыя рэшткі 983 зубраў. У археал. л-ры косцішча А. разглядаецца як месца адначасовага палявання на вял. статак зуброў, рэшткі свяцілішча ці вынік шматгадовага палявання жыхароў стаянкі.

**АМВРО́СІЙ** (1426 або каля 1430 — каля 1494), рускі разьбяр і ювелір. Працаваў у Троіцка-Сергіевай лаўры. Створаны ім разьбяны абразок-складзень з выявай Тройцы (1456) — выдатны помнік стараж.-рус. мініяцюры. У гэтым творы, а таксама ў работах інш. майстроў, што працавалі з А., прыкметны ўплыў А.*Рублёва*. *А.К.Лявонава.*

**АМВРО́СЬЕЎ** Аляксей Пятровіч (н. 23.3.1925, в. Кіў-Серт Мураты Вурнарскага р-на, Чувашыя), вучоны ў галіне марфалогіі, радыебіялогіі і цытагенетыкі. Д-р мед. н. (1969), праф. (1970). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1954). З 1954 у Ін-це фізіялогіі, з 1987 — радыебіялогіі АН Беларусі. Навук. працы па ўзроставай анатоміі нерв. сістэмы чалавека і жывёл, радыяцыйнай марфалогіі і эмбрыялогіі.

*Тв.*: Нейрогуморальная регуляция и двигательная активность при старении. Мн., 1984 (у сааўт.).

**АМГА́**, рака ва Усх. Сібіры, левы прыток Алдана, у Рэспубліцы Саха (Якуція). Даўж. 1462 км, пл. бас. 69,3 тыс. км$^2$. Пачынаецца на Алданскім нагор'і, цячэ ў вузкай і глыбокай даліне з камяністым рэчышчам, у нізоўях — на Цэнтральнаякуцкай нізіне, даліна шырокая, рэчышча звілістае. Жыўленне снегавое і дажджавое. Высокае веснавое разводдзе і частыя летнія паводкі. Ледастаў з кастр. да мая. Зімой наледзі. Сярэднегадавы расход вады каля 190 м$^3$/с. У бас. А. больш за 5,5 тыс. азёраў. Суднаходная на 472 км ад вусця.

**АМГО́ВІЧЫ**, вёска ў Беларусі, у Слуцкім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 23 км на ПнУ ад Слуцка, 125 км ад Мінска, 25 км ад чыг. ст. Слуцк. 520 ж., 202 двары (1995). Сярэдняя школа, клуб, бальніца, аддз. сувязі. За 0,3 км на ПдЗ ад А. гарадзішча жал. веку. Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан.

**АМДУРМА́Н**, горад у Судане, пры зліцці рэк Белы Ніл і Блакітны Ніл. 527 тыс. ж. (1988). Разам з горадам Хартум і Паўн. Хартум утварае адзіны «трайны горад», у якім больш за 1,3 млн. ж. (1988). Гандл.-трансп. цэнтр (гандаль жывёлай, скурамі, тканінамі, гуміарабікам). Тэкст., гарбарная, харч. прам-сць. Ісламскі ун-т. Нац. тэатр. Маўзалей Махдзі Мухамеда Ахмеда.

**АМЕБЕ́ЙНАЯ КАМПАЗІ́ЦЫЯ** (ад грэч. amoibaios папераменны), у вершаскладанні будова паэт. твора, заснаваная на кампазіцыйным паралелізме (паўтарэнні вершаванага радка або страфы). Шырока ўжываецца ў фальклоры (нар. песні). Выкарыстана Ф.Багушэвічам у вершы «Песня», заснаваным на чаргаванні пытальных і сцвярджальных інтанацый: «Чым бяздомны, мужычок? // — Бо чужога гляджу. // Чаму хіцёр, мужычок? // — Бо дурны, як варона. // Чаго ўмёр, мужычок? // — Уцякаў ад закона!» Найчасцей у аснове А.к. ляжыць прыём *анафары*.

**АМЕ́ГА**, назва апошняй літары грэч. алфавіта ω, што ўзнікла ў выніку графічнага відазмянення О («амікрон»). У класічным грэч. і візант. пісьме абазначала доўгі гук «о», мела лічбавае значэнне 800. З'явілася крыніцай для кірыліцкай ω («амега»). У старабел. пісьменстве ўжывалася для перадачы гука «о» пераважна ў пач. слоў («ωлво», «ωрати») і як лічба 800. У бел. мове, многіх еўрап. мовах слова «А». азначае канец чаго-небудзь («альфа і амега» — пачатак і канец, усё галоўнае).

*А.М.Булыка.*

**АМЕ́ЖНІК** (Oenanthe), род кветкавых раслін сям. сельдэрэевых. Каля 40 відаў. Пашыраны ва ўмераных абласцях Еўропы, Азіі, гарах трапічнай Афрыкі, у Паўн. Амерыцы. Культывуюцца ў Галандыі. На Беларусі па берагах рэк і азёраў, на балотах расце А. вадзяны (O. aquatica); у наваколлях Магілёва і Гродна адзначаны А. дудкаваты (O. fistulosa). Ядавітыя (у каранях атрутнае смолападобнае рэчыва энантатаксін).

Адна- або шматгадовыя травяністыя расліны з вельмі галінастым пустацелым сцяблом выш. да 1,2 м. Лісце двойчы-тройчы перыстарассечанае. Кветкі дробныя белыя або ружаватыя ў складаных парасонніках. Плод — падоўжана-яйцападобны вісла-плоднік (мае эфірны алей). Выкарыстоўваюцца ў медыцыне.

**АМЕ́ЛЬЧАНКА** Пётр Адамавіч (н. 18.6.1935, в. Пятраш Хойніцкага р-на Гомельскай вобл.), бел. вучоны ў галіне машынабудавання. Д-р тэхн. н. (1988), праф. (1990). Скончыў БПІ (1958). З 1958 на Мінскім трактарным з-дзе, з 1978 яго ген. канструктар. Навук. працы па выбары і абгрунтаванні параметраў універсальна-прапашных трактароў і праблемах надзейнасці іх работы. Дзярж. прэмія Беларусі 1994.

*Тв.*: Тракторы для работы на склонах. М., 1974 (у сааўт); Трактор «Беларусь» МТЗ-80 и его модификации. М., 1991 (разам з І.П.Ксяневічам, П.Н.Сцепанюком); Агрегатирование тракторов «Беларусь». Мн., 1993 (разам з Б.Я.Шнейсерам, М.Р.Шабунем).

**АМЕЛЬЯНО́ВІЧ** Уладзімір Аляксандравіч (н. 1.7.1924, в. Падкасоўе Навагрудскага р-на Гродзенскай вобл.), поўны кавалер ордэна Славы. Засл. работнік сельскай гаспадаркі Беларусі (1975). З 1944 на 3-м Бел. і 1-м Далёкаўсх. франтах. Разведчык сапёрнага батальёна, яфрэйтар, вызначыўся ў баях ва Усх. Прусіі пры размініраванні мінных палёў, пры разгроме Квантунскай арміі Японіі на Д.Усходзе.

**АМЕЛЬЯНЮ́К** Уладзімір Сцяпанавіч (1917, г. Дно Пскоўскай вобл. — 26.5.1942), адзін з арганізатараў і кіраўнікоў *Мінскага патрыятычнага падполля* ў Вял. Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1965). Напярэдадні вайны студэнт Камуніст. ін-та журналістыкі ў Мінску. З жн. 1941 у складзе Камароўскай падп. парт. групы г. Мінска. З пач. мая 1942 чл. Мінскага падп. гаркома КП(б)Б, заг. аддзела агітацыі і прапаганды, рэдактар падп. выданняў, 1-га нумара падп. газ. *«Звязда»*. Загінуў пры выкананні баявога задання.

**АМЕЛЯНЕ́Ц**, Амельянец, вёска ў Беларусі, у Каленкавіцкім с/с Камянецкага р-на Брэсцкай вобл. Цэнтр калгаса. За 32 км на ПнЗ ад Камянца, 71 км ад Брэста, 29 км ад чыг. ст. Высока-Літоўск. 390 ж., 137 двароў (1995). Сярэдняя школа, б-ка, Дом культуры, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Крыжаўзвіжанская царква — помнік драўлянай архітэктуры канца 19 ст.

**АМ'Е́Н** (Amiens), горад на Пн Францыі, адм. ц. дэпартамента Сома і гал. горад гіст. вобласці Пікардыя. Прыстань на р. Сома. 154 тыс. ж. з прыгарадамі (1990). Маш.-буд., металургічная, хім., лёгкая і харч. прам-сць.

У старажытнасці А. — цэнтр гальскага племені амбіянаў, у сярэднія вякі — аднайм. графства. У 1435—77 у складзе *Пікардыі* ўваходзіў у Бургундскую дзяржаву. Тут заключаны *Ам'енскі мірны дагавор 1802.* Каля А.

Амежнік вадзяны.

адбыліся буйныя ваен. аперацыі ў час франка-прускай 1870—71 і 1-й сусв. войнаў (гл. *Ам'енская аперацыя 1918*). Моцна разбураны ў часы 1-й і 2-й сусв. войнаў. Пры аднаўленні (1944—54, па планах арх. П.Дзюфо) захавана сярэдневяковае аблічча гіст. цэнтра. Вядомы арх. помнікамі: руіны познаант. сцен, амфітэатра і тэрмаў, гатычны *Ам'енскі сабор*, цэрквы Сен-Жэрмен (15 ст.), Сен-Ло (16 ст.), Сен-Рэмі (17 ст., рэканструявана ў канцы 19 ст.), Сен-Жак (1838), гадзіннікавая вежа (15—18 ст.), цытадэль (1589), рэнесансавыя атэлі, ратуша (17 ст., перабудавана ў 19 ст.), прэфектура (б. будынак інтэнданцтва, 1761), тэатр (1779—83). Музей Пікардыі (засн. ў 1854).

**АМЕНАРЭ́Я** (ад *а...* + грэч. mēn месяц + rheō цяку), адсутнасць *менструацый* на працягу 6 і больш месяцаў у палавaспелых жанчын (ад 15—16 да 45 гадоў). Абумоўлена недастатковасцю гармонаў, якія дзейнічаюць на *палавыя органы* жанчыны, або неўспрымальнасцю палавых органаў да гармонаў. Фізіялагічная А. назіраецца да

У.С.Амельянюк.

*палавой спеласці*, у перыяд *цяжарнасці*, лактацыі і ў клімактэрычны перыяд. Пры несапраўднай А. менструальны цыкл нармальны, але кроў не выходзіць вонкі з прычыны заган развіцця палавых органаў (адсутнасць похвы або шыйкі маткі, адтуліны ў дзявоцкай пляве і інш.). Пры сапраўднай паталагічнай А. адсутнічаюць цыклічныя змены ў палавых органах, фізіял. працэсы выспявання фалікулаў і яйцаклеткі, што выклікае бясплоднасць; парушана функц. сістэма рэгуляцыі менструальнай і ў цэлым генератыўнай функцыі жанчыны (гіпаталамус—гіпофіз—перыферычныя залозы—палавыя органы). Адрозніваюць А. паталагічную першасную (менструацыі не было ні разу ў жыцці), абумоўленую паталогіяй выспявання яечнікаў, надныракавых, шчытападобнай залозы, маткі, а таксама гіпаталама-гіпафізарнай вобласці і вышэйшых аддзелаў ц.н.с. Развіваецца пры ўздзеянні неспрыяльных фактараў на арганізм жанчыны ў перыяд унутрыутробнага развіцця і адразу пасля родаў. А. паталагічная другасная (менструацыя была хоць адзін раз) звязана таксама з захворваннямі органаў — звёнаў рэгуляцыі менструальнай функцыі ў выніку запаленчых, функцыян., арган. (пухліны) пашкоджанняў, нервова-псіхічных стрэсаў і інш. у перыяд палавой сталасці. Папярэднічае хваробе гіпаменструальны сіндром: менструацыі (пасля нармальных) рэдкія, кароткія, з мізэрным крывацёкам. Для лячэння неабходна спец. абследаванне.

*І.І.Дуда.*

**АМЕНЕМХЕ́Т I**, егіпецкі фараон [каля 1991—1962 да н.э.]. Заснавальнік XII дынастыі (Сярэдняе царства). Вёў барацьбу за аслабленне ўлады мясц. правіцеляў-манархаў, здзейсніў паход у Палесціну, у вайне з лівійцамі заваяваў вобласць Ват. Загінуў у час палаца-

вага перавароту. Захавалася «Павучанне» А. I яго сыну Сенусерту I.

**АМЕНЕМХЕ́Т II**, егіпецкі фараон [каля 1929 — каля 1892 да н.э.] эпохі Сярэдняга царства (XII дынастыя). Пры ім умацаваліся эканам. сувязі Егіпта з суседнімі краінамі. Прадаўжаў палітыку ваен. і эканам. пранікнення ў краіны Куш (тэр. сучаснага Судана і ч. Егіпта) і ў Пунт (Усх. Афрыка). Паводле *Манефона*, загінуў у выніку палацавага перавароту.

**АМЕНЕМХЕ́Т III**, егіпецкі фараон [каля 1844—1797 да н.э.] эпохі Сярэдняга царства (XII дынастыя). Пры ім інтэнсіўна будаваліся храмы, былі расшыраны медныя руднікі на Сінайскім п-ве, у выніку ірыгацыйных работ у Фаюмскім аазісе створана штучнае Мерыдава воз., узведзены вял. будынак у Фаюме, названы грэкамі Лабірынтам (прыраўноўваўся да сямі дзівосаў свету), 2 піраміды. Праўленне А. III — перыяд т.зв. другога росквіту Егіпта.

**АМЕНСАЛІ́ЗМ** (ад *a*... + лац. mensa стол, трапеза), форма ўзаемадзеяння паміж папуляцыямі (арганізмамі), калі адна з іх адмоўна ўздзейнічае на другую без карысці для сябе і без адмоўнага ўплыву з боку той, на якую ўздзейнічае. Назіраецца, напр., паміж плесневымі грыбамі, што прадуцыруюць антыбіётыкі, і бактэрыямі, жыццядзейнасць якіх пры гэтым прыгнечваецца або істотна абмяжоўваецца; паміж драпежнікамі і ўшкамі, якія іх суправаджаюць і здольныя наклікаць на іх ворага або ўскладніць паляванне. Гл. таксама *Каменсалізм, Паразітызм.*

**АМ'Е́НСКАЯ АПЕРА́ЦЫЯ 1918**, наступальная аперацыя англа-французскіх войскаў 8—13 жніўня супраць германскіх армій у 1-ю сусв. вайну. Праведзена з мэтай ліквідацыі Ам'енскага выступу і аховы ад арт. абстрэлу чыг. Парыж—Кале. На ўчастку прарыву (76 км) былі сканцэнтраваны гал. сілы і сродкі 4-й англ., 1-й і 3-й франц. армій, больш за 500 танкаў і самалётаў супраць 2-й і ч. войскаў 18-й герм. армій. Ням. войскі з вял. стратамі былі адкінуты. А.а. стала пачаткам агульнага паражэння Германіі, якая ў ліст. 1918 вымушана была капітуляваць.

**АМ'Е́НСКІ МІ́РНЫ ДАГАВО́Р 1802**. Падпісаны паміж Францыяй і яе саюзнікамі (Іспаніяй і *Батаўскай рэспублікай*) з аднаго боку і Англіяй — з другога 27.3.1802 у г. Ам'ен (Францыя). Завяршыў распад 2-й антыфранц. каліцыі. Паводле яго Англія абавязвалася вярнуць Францыі і яе саюзнікам захопленыя ў іх калоніі (акрамя а-воў Цэйлон і Трынідад) і ачысціць ад сваіх войскаў в-аў Мальта, Францыя — вывесці войскі з Рыма, Неапаля і в-ва Эльба. Егіпет быў вернуты Турцыі. 13.5.1802 да дагавора далучылася Турцыя. А.м.д. стаў кароткай перадышкай у англа-франц. барацьбе за сусв. панаванне. Разарваны з прычыны адмовы Англіі вызваліць в-аў Мальта. 22.5.1803 ваенныя дзеянні аднавіліся.

**АМ'Е́НСКІ САБО́Р**, сабор Нотр-Дам, помнік гатычнай архітэктуры; адзін з буйнейшых гатычных сабораў у Еўропе. Пабудаваны ў г. Ам'ен (Францыя) у 1220—88 паводле плана Рабера з Люзарша пры ўдзеле Тома і Рэно з Кармона. 3-нефавая базіліка з 3-нефавым трансептам, з 3 галерэямі і 2 вежамі. Даўж. гал. нефа 143 м, выш. 42,5 м. Бакавыя капэлы дабудоўваліся ў 1292—1376, драўляны шпіль над сяродкрыжжам — пасля 1528. Гатычная скульптура парталаў — 13—14 ст., у т.л. знакамітыя статуі «Міласцівы Бог» і «Залатая Багародзіца». У інтэр'еры скульптура 13—17 ст., вітражы 13—14 ст.

Ам'енскі сабор. Заходні фасад.

**АМЕНХАТЭ́П III**, егіпецкі фараон [1417—1379 да н.э.] эпохі Новага царства (XVIII дынастыя). На пачатку яго праўлення Егіпет дасягнуў найб. ваен. магутнасці сярод дзяржаў Усх. Міжземнамор'я, пашырыў тэр. ад вярхоўя Еўфрата на Пн да 4-га парога Ніла на Пд. Пры ім пабудаваны храм Амона-Ра ў Луксоры і надмагільны храм А. III з вялізнымі статуямі цара — «калосамі Мемнана». У апошнія гады праўлення А. III унутр. супярэчнасці і націск хетаў аслабілі краіну.

**АМЕНХАТЭ́П IV**, Эхнатон, егіпецкі фараон [1379—1362 да н.э.] эпохі Новага царства (XVIII дынастыя). Сын Аменхатэпа III. Каб зламаць магутнасць фіванскіх жрацоў і старой знаці, звязаных з культам бога *Амона*, абвясціў новы дзярж. культ бога *Атона*. Зрабіў сталіцай г. Ахетатон, сам прыняў імя Эхнатон («карысны Атону»). Пры А. IV Егіпет пачаў страчваць уладу над Сірыяй і Палесцінай, сітуацыю пагаршалі набегі качавых плямёнаў хабіру ў азіяцкія ўладанні Егіпта.

**АМЕНХАТЭ́П МАЛО́ДШЫ**, Аменхатэп, сын Хапу (каля 1460, Атрыбіс, Ніжні Егіпет — каля 1380 да н.э.), старажытнаегіпецкі архітэктар, быў на ваен. і дзярж. службе. Дарадца *Аменхатэпа III*, настаўнік малалетняга *Аменхатэпа IV*. Пабудаваў храм бога Амона-Ра ў Луксоры (разам з арх. братамі Горы і Суці), храмы ў Салебе і Седэінгу, грандыёзныя помнікі ў *Карнаку — храм бога Хансу, храм багіні Мут, алею сфінксаў паміж Луксорам і Карнакам (захаваліся калосы Мемнана). Недалёка ад храма Тутмоса II узведзены храм у гонар А. М.*

Аменхатэп IV.

*Літ.*: Жак К. Египет великих фараонов: История и легенда: Пер. с фр. М., 1992. С. 182—183.

**АМЕ́НЦЫЯ** (ад лац. amentia вар'яцтва), від зацямнення свядомасці (фрагментарнасць успрымання, бязладнае мысленне, узбуджэнне, потым *амнезія*).

**А́МЕР**, Амір Махамед Абд аль-Хакім (11.12.1919, Істал, прав. Мінья — 14.9.1967), егіпецкі ваен. і паліт. дзеяч, маршал (1957). З 1952 галоўнакамандуючы егіп. ўзбр. сіламі, з 1958 — 2-і віцэ-прэзідэнт і ваен. міністр *Аб'яднанай Арабскай Рэспублікі*. Абвінавачаны ў паражэнні краіны ў ваен. канфлікце з Ізраілем у чэрв. 1967, пазбаўлены пасад і арыштаваны. Скончыў жыццё самагубствам.

**АМЕРЫ́ГА ВЕСПУ́ЧЫ**, гл. *Веспучы.*

**АМЕ́РЫКА**, частка свету, утвораная 2 мацерыкамі — Паўн. Амерыкай і Паўд. Амерыкай. У склад А. ўваходзіць самы вял. ў свеце в-аў Грэнландыя і шэраг інш. сумежных а-воў. Размешчана ў Зах. паўшар'і паміж Атлантычным і Ціхім акіянамі. На Пн абмываецца водамі Паўн. Ледавітага ак. Мяжу паміж мацерыкамі праводзяць па Дар'енскім (часцей па Панамскім) перашыйку. На Пд Паўн. А. часта вылучаюць *Цэнтральную Амерыку* (паміж Тэўантэпекскім і Панамскім перашыйкамі), *Вест-Індыю* (а-вы Атлантычнага ак. і яго Карыбскага м. паміж мацерыкамі Паўн. і Паўд. Амерыкі), *Лацінскую Амерыку*. Агульная пл. 42,5 млн. км². Нас. 740,3 млн. чал. (1992).

Грэнландыю і паўн.-ўсх. ўзбярэжжа Паўн. Амерыкі адкрылі нарманы ў 10—11 ст. Афіцыйна адкрыццё А. датуецца 12.10.1492, калі экспедыцыя мараплаўца Х.*Калумба* дасягнула Багамскіх а-воў. Названа латарынгскім картографам М.Вальдземолерам у яго «Уводзінах у касмаграфію» (1507) у гонар фларэнційца *Веспучы Амерыга*, які ўпершыню выказаў думку, што адкрытая ў Зах. паўшар'і зямля з'яўляецца новай часткай свету. Існуе таксама меркаванне, што назва А. паходзіць ад мясц. племя туземцаў, якое жыло каля воз. Нікарагуа і звалася «амерыкас». Аб прыродзе, гісторыі, эканоміцы і дзяржавах гл. ў арт. *Паўночная Амерыка* і *Паўднёвая Амерыка*.

*Г.Я.Рылюк.*

**«АМЕ́РЫКАН ТЭ́ЛЕФОН ЭНД ТЭ́ЛЕГРАФ КО́МПАНІ»** (American Telephone and Telegraph Company; ATT), найбуйнейшая электронная і электратэхнічная манаполія ЗША па вытв-сці слабаточнага абсталявання. Засн. ў 1885. Выпускае абсталяванне сувязі, ЭВМ і інш. электронную тэхніку. Абслугоўвае амер. і міжнар. лініі далёкай тэлеф. і тэлетайпнай сувязі.

**«АМЕРЫКА́НА»**, гл. *Амерыканская энцыклапедыя*.

**АМЕРЫКА́НА-АНГЛІ́ЙСКАЯ ВАЙНА́ 1812—14**, гл. *Англа-амерыканская вайна 1812—14*.

**АМЕРЫКА́НА-ІСПА́НСКАЯ ВАЙНА́ 1898**, гл. *Іспана-амерыканская вайна 1898*.

**АМЕРЫКА́НА-КІТА́ЙСКІ ДАГАВО́Р 1946** аб дружбе, гандлі і навігацыі. Падпісаны 4.11.1946 у Нанкіне паміж ЗША і ўрадам *Чан Кайшы*. Фактычна нераўнапраўны дагавор меў на мэце замацаваць і пашырыць ролю амер. капіталу ў эканоміцы паўкалан. Кітая, забяспечыць манаполіям і грамадзянам ЗША усе правы, якімі карысталіся кіт. карпарацыі і грамадзяне; дэкларавaў роўныя правы кітайцам у іх эканам. дзейнасці ў ЗША, што было не па сіле эканамічна слабаму Кітаю. Скасаваны ў 1949 пасля ўтварэння КНР.

**АМЕРЫКА́НА-МЕКСІКА́НСКАЯ ВАЙНА́ 1846—48**, вайна ЗША супраць Мексікі. З'явілася вынікам экспансіі ЗША, якія, анексіраваўшы Тэхас (29.12.1845), прэтэндавалі на Каліфорнію і Новую Мексіку. 13.5.1846 ЗША абвясцілі Мексіцы вайну. У ходзе баявых дзеянняў (1846 — пач. 1847) амер. войскі занялі Каліфорнію і значную ч. Паўн. Мексікі. У сак. 1847 амер. дэсант высадзіўся ў порце Веракрус. 14.9.1847 была захоплена сталіца Мексікі. Паводле падпісанага ў лют. 1848 у Гуадалупе-Ідальга мірнага дагавора, мекс.-амер. граніца прайшла па р. Рыо-Грандэ, Мексіка страціла больш за палавіну сваёй тэрыторыі (Тэхас, Новую Мексіку, ч. Арызоны, Верхнюю Каліфорнію).

**АМЕРЫКА́НА-ПАНА́МСКІЯ ДАГАВО́РЫ 1903, 1936, 1955, 1977** аб канале. Дагавор Хея — Бюно-Варыльі 1903 (падпісаны 18 ліст. ў Вашынгтоне) гарантаваў незалежнасць Панамскай Рэспублікі (абвешчана 3.11.1903), а Панама здавала ў арэнду ЗША «на неабмежаваны час» частку сваёй тэр. шырынёй 16,1 км для будаўніцтва і эксплуатацыі міжакіянскага канала і саступала ім усе суверэнныя правы над зонай Панамскага канала. ЗША атрымала таксама права манапольна эксплуатаваць усе шляхі зносін праз тэр. Панамы паміж Ціхім ак. і Карыбскім м., выкарыстоўваць свае ваен. і паліцэйскія сілы для падтрымання парадку і абароны канала. За гэта ЗША павінны былі выплаціць Панаме 10 млн. дол. адначасова і выплачваць па 250 тыс. дол. штогод праз 9 гадоў пасля абмену ратыфікацыйнымі граматамі.

Дагавор 1936 (падпісаны 2 сак. ў Вашынгтоне) адмяняў артыкулы дагавора 1903 пра гарантыі ЗША падтрымліваць незалежнасць Панамы і парадак у яе гарадах Панама і Калон. ЗША адмовіліся (фармальна) ад права карыстацца тэр. за межамі канала. Штогадовыя выплаты Панаме павялічваліся да 430 тыс. дол.

Дагавор Рэмона—Эйзенхаўэра 1955 (падпісаны 25 студз. разам з «Мемарандумам аб узгодненых рашэннях», які рэгуляваў заробак мясц. служачых кампаніі Панамскага канала), адмяняў манапольнае права ЗША будаваць чыгункі і шашэйныя дарогі на Панамскім перашыйку, ураўнаваў у зарплаце панамцаў з амерыканцамі, павялічваў штогадовыя выплаты да 1930 тыс. дол. Панаме вярталася частка зямлі, раней набытая ў яе кампаніяй канала.

Дагавор аб Панамскім канале і Дагавор аб пастаянным нейтралітэце і функцыянаванні Панамскага канала 1977 (падпісаны 7 вер. ў Вашынгтоне прэзідэнтам ЗША Дж.Картэрам і кіраўніком урада Панамы А.Тарыхасам) прадугледжвалі канчатковую перадачу канала пад кантроль Панамы 1.1.2000, ліквідацыю зоны канала і вывад амер. войскаў з размешчаных у ёй ваен. базаў, павелічэнне штогадовых выплат да 10 млн. дол. і інш. Панама абвяшчае канал пастаянна нейтральным і разам з ЗША адказвае за «захаванне рэжыму нейтралітэту». Ваен. і дапаможныя судны абедзвюх дзяржаў маюць права на «хуткі транзіт праз канал». Абодва дагаворы ўхвалены на плебісцыце ў Панаме, які адбыўся 23.10.1977. З 1982 Панама пачала ажыццяўляць цывільнае кіраванне і паліцэйскую ўладу ў зоне канала.

**АМЕРЫКА́НА-ФІЛІПІ́НСКАЯ ВАЙНА́ 1899—1901**, каланіяльная вайна ЗША супраць Філіпін. Не прызнаўшы незалежнасці маладой Філіпінскай Рэспублікі, ЗША абвясцілі сябе яе суверэнам. Размешчаная на Філіпінах 25-тысячная армія ЗША 4.2.1899 разгарнула баявыя дзеянні супраць рэсп. войскаў (каля 16 тыс. чал.). Але за паўгода яна прасунулася толькі на 100—120 км на Пн ад Манілы. Выклікаўшы сярод філіпінцаў раскол, які прывёў да прымусовай адстаўкі кіраўніка ўрада А.Мабіні і забойства галоўнакамандуючага рэсп. арміяй А.Луны, амер. войскі ў кастр. пачалі новае наступленне. Пераход на бок ЗША часткі мясц. памешчыкаў і буржуазіі аслабіў супраціўленне філіпінскай арміі, і яна распалася на партыз. атрады. Паланенне прэзідэнта Э.*Агінальда* (23.3.1901) і яго прысяга на вернасць ЗША фактычна спынілі вайну. Баі партыз. груп працягваліся да 1913.

**АМЕРЫКА́НА-ФРАНЦУ́ЗСКІ ДАГАВО́Р 1778**. Падпісаны 6 лют. ў Парыжы Б.*Франклінам* і франц. міністрам замежных спраў Ш.Вержэнам. Прадугледжваў уступленне ў вайну з Англіяй Францыі, якая абавязалася абараняць «свабоду, суверэнітэт і незалежнасць» 13 паўн.-амер. калоній і не складаць зброі да таго часу, пакуль Англія не прызнае іх незалежнасць. Дагавор перастаў дзейнічаць у 1794, калі ЗША абвясцілі пра свой нейтралітэт у вайне Францыі супраць кааліцыі еўрап. дзяржаў на чале з Англіяй.

**АМЕРЫКА́НА-ЯПО́НСКІЯ ДАГАВО́РЫ 1951, 1960**. Дагавор бяспекі 1951. Падпісаны 8 вер. ў Сан-Францыска на нявызначаны тэрмін. Навязаны Японіі ЗША як умова заключэння мірнага дагавора. Паводле яго ЗША атрымалі права мець на тэр. Японіі свае ўзбр. сілы і выкарыстоўваць іх для аперацый на Д.Усходзе і задушэння хваляванняў унутры краіны; без згоды ЗША на яп. тэр. не маглі размяшчацца базы і войскі трэцяй дзяржавы. Страціў сілу ў сувязі з заключэннем дагавора 1960. Дагавор аб узаемным супрацоўніцтве і гарантыі бяспекі падпісаны 19.1.1960 у Вашынгтоне тэрмінам на 10 гадоў (прадоўжаны на няпэўны тэрмін у ліст. 1969); ратыфікаваны 22.6.1960. Паводле яго ЗША замацавалі сваё права мець на тэр. Японіі ўзбр. сілы і ваен.

базы. Японія абавязвалася нарошчваць свой ваен. патэнцыял і выкарыстоўваць яго ў выпадку агульнай небяспекі. Дагавор адмоўна ўспрыняты народам і выклікаў хваляванні ў Японіі.

**АМЕРЫКАНО́ІДНАЯ РА́СА**, адгалінаванне вял. мангалоіднай расы, уключае карэннае насельніцтва Амерыкі — *індзейцаў*. Асн. прыкметы чалавека А.р. — прамыя чорныя валасы, цёмныя вочы, скура з бурым адценнем, вял. твар, вусы і барада растуць слаба. Сярод прадстаўнікоў А.р. адсутнічаюць рэзус-адмоўныя індывідуумы, амаль усе яны маюць 0 (I) групу крыві, што разам са слаба развітой мангольскай складкай павека і адносна буйным носам адрозніваe амерыканоідаў ад мангалоідаў. Індзейцы складаюць значную частку сучаснага насельніцтва ў краінах

Да арт. **Амерыканская адміністрацыя дапамогі**. Пастанова сав. ўрада ад 10.7.1923 а падзякай амерыканскай адміністрацыі за дасланыя пасля 1-й сусветнай вайны прадукты харчавання.

Паўд. Амерыкі, у Паўн. Амерыцы іх засталося няшмат. *А.І.Мікуліч.*

**АМЕРЫКА́НСКАЯ АДМІНІСТРА́ЦЫЯ ДАПАМО́ГІ** (American Relief Administration; ARA), урадавая арг-цыя ЗША у 1919—23 па аказанні харчовай і інш. дапамогі еўрап. краінам, што пацярпелі ў 1-ю сусв. вайну. Узначальваў Г.*Гувер*. Фактычна выкарыстоўвалася для ўмацавання эканам. і паліт. пазіцый ЗША, стрымлівання рэв. руху ў Венгрыі, Румыніі, Балгарыі і інш. У 1921—22 аказала дапамогу ў час голаду ў Паволжы, на Украіне. У выніку канкурэнцыі з боку Англіі, Францыі і Італіі яе дзейнасць у Еўропе спынена.

**АМЕРЫКА́НСКАЯ АКАДЭ́МІЯ КІНЕМАТАГРАФІ́ЧНЫХ МАСТА́ЦТВАЎ І НАВУ́К** (Academy of Motion Picture Arts and Sciences; АМПАС), Амерыканская кінаакадэмія, грамадская арг-цыя ў ЗША. Засн. ў 1927 у Галівудзе. Займаецца праблемамі павышэння адукацыйнага, прафес. і тэхн. ўзроўню амер. кінематаграфіі. Аб'ядноўвае больш за 4 тыс. членаў. Мае 12 секцый (рэжысёрская, акцёрскага мастацтва, сцэнарная, кампазітарская, прадзюсерская і інш.). Вядзе інфармацыйную (з разы на год выдае каталогі бягучай амер. кінапрадукцыі, даведнікі) і лекцыйную работу, дапамагае маладым кінематаграфістам. З 1929 штогод прысуджае прэміі «Оскар» амер. (іншы раз англ.) фільмам за дасягненні ў 26 асобных галінах кінематографа (па

Жарабец **амерыканскай стандартбрэднай пароды**.

26 намінацыях), а таксама за лепшы замежны фільм года. Прысуджаюцца спец. прэміі «Оскар» за ўклад у кінамастацтва ў цэлым. З 1973 арганізуе конкурсы студэнцкіх фільмаў.

**АМЕРЫКА́НСКАЯ СТАНДАРТБРЭ́ДНАЯ ПАРО́ДА** коней, амерыканская рысістая парода, хуткаалюрная запражная парода. Выведзена ў ЗША у 19 ст. скрыжаваннямі з чыстакроўнай верхавой нарфолкскай, галандскай рысістай, канадскімі інаходцамі і інш. пародамі гал. чынам для спарт. спаборніцтваў на іпадромах. Гадуюць у ЗША, Канадзе, краінах Еўропы. У Расіі з яе ўдзелам выведзена *руская рысістая парода*. На Беларусі выкарыстоўваецца як паляпшальнік рысістых парод.

Масць гнядая, вараная, рыжая. У выніку аднабаковага адбору на рэзвасць коні не вырўнаваны па экстэр'еры; выш. ў карку 145—166 см. Абсалютны рэкорд на 1 мілю рыссю 1 мін 54,4 с, інхаддзю 1 мін 49 с.

**Амерыканскі белы матыль і яго вусень.**

**АМЕРЫКА́НСКАЯ ФЕДЭРА́ЦЫЯ ПРА́ЦЫ** (American Federation of Labor; АФП), прафсаюзнае аб'яднанне ў ЗША у 1886—1955. Узнікла на аснове створанай у 1881 Федэрацыі арганізаваных прафсаюзаў ЗША і Канады; аб'ядноўвала 90 арг-цый кваліфікаваных рабочых пад кіраўніцтвам С.*Гомперса* (старшыня АФП да 1924). Будавалася паводле цэхавага прынцыпу. Прадстаўляла выключна эканам. інтарэсы рабочых. Ускладняла прыём у прафсаюзы для некваліфікаваных рабочых, неграў і імігрантаў. У 1930-я г. частка прафс. арг-цый левай арыентацыі выйшла з АФП і стварыла *Кангрэс вытворчых прафсаюзаў*, з якім у 1955 АФП (каля 10 млн. чл.) аб'ядналася ў адзіную *Амерыканскую федэрацыю працы — Кангрэс вытворчых прафсаюзаў*.

**АМЕРЫКА́НСКАЯ ФЕДЭРА́ЦЫЯ ПРА́ЦЫ — КАНГРЭ́С ВЫТВО́РЧЫХ ПРАФСАЮ́ЗАЎ** (American Federation of Labor-Congress of Industrial Organizations АФП—КВП), найбольшае прафс. аб'яднанне ў ЗША. Створана ў 1955 у выніку зліцця *Амерыканскай федэрацыі працы* і *Кангрэса вытворчых прафсаюзаў*. Да 1969 уваходзіла ў *Міжнародную канфедэрацыю свабодных прафсаюзаў*. Штаб-кватэра ў г. Вашынгтон. З'яўляецца асн. сацыял-рэфармісцкай сілай у краіне, на прэзідэнцкіх выбарах у асноўным падтрымлівае Дэмакр. партыю. У сваёй дзейнасці зыходзіць з ідэі, што рабочыя павінны мець права на забастоўку, выкарыстоўвае метады калект. торгу (для дасягнення калект. дагавору з работадаўцам) і папраўак да закону (паляпшэнне існуючых законаў); кіраўніцтва АФП—КВП выступае супраць левага радыкалізму і свабоднай рыначнай стыхіі. Аб'ядноўвае (1994) 98 найбуйнейшых прафсаюзаў краіны: рабочых буд. прам-сці, транспартнікаў, партовых грузчыкаў усх. ўзбярэжжа і інш.; больш за 14,5 млн. чл. Старшыні АФП—КВП: Дж.Міні (1955—79), Л.Керкленд (з 1979). Друкаваныя органы: штотыднёвік «AFL—CIO News» («Навіны АФП—КВП») і штомесячны час. «American Federationist» («Амерыканскі федэрацыяніст»).

**АМЕРЫКА́НСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕ́ДЫЯ, «Амерыкана»** (The Encyclopedia Americana), універсальная энцыклапедыя ў ЗША. 1-е выд. выйшла ў Філадэльфіі ў 1829—33 (т. 1—13; скл. Ф.Лібер). З 1903 выдаецца ў Нью-Йорку (т. 1—16, 1903—04; з 1918 перавыда-

ецца ў 30 т.). Змяшчае каля 70 тыс. артыкулаў па гуманітарных, прыродазнаўчых і дакладных навуках, тэхніцы, эканоміцы, палітыцы. Асабліва падрабязны матэрыял прыводзіцца пра ЗША і інш. краіны Амерыкі. Большасць артыкулаў — сціслыя даведкі-дэфініцыі; грунтоўныя агляды даюцца пра асобныя краіны, усе стагоддзі новай эры (ад 1-га да 20-га), выдатныя творы сусв. л-ры, музыкі, філасофіі і эканомікі, амер. паліт. дзеячаў і інш. Найб. складаныя артыкулы маюць невял. слоўнікі тэрмінаў. Т. 30 змяшчае ілюстраваную храналогію сусв. падзей за апошнія 5 гадоў і алфавітны індэкс — больш за 350 тыс. тэрмінаў і слоў, што выкарыстаны ў артыкулах А.э. З 1923 у дадатак да А.э. выдаецца 1-томны штогоднік. *В.К.Шчэрбін.*

**АМЕРЫКА́НСКІ БЕ́ЛЫ МАТЫ́ЛЬ** (Hyphantria cunea), матыль сямейства мядзведзіц. Радзіма — Паўн. Амерыка. У Еўропе ўпершыню выяўлены ў Венгрыі (1940). Пашырыўся па інш. краінах Еўропы. Шкодзіць раслінаводству.

Размах крылаў 2,0—3,5 см. У некаторых асобін на брушку і крылах дробныя чорныя плямкі. Вусені даўж. 2,5—3,5 см, усёедныя, кормяцца больш як на 200 відах раслін. За год 2 пакаленні. Матылі першага пакалення вылятаюць у маі, другога — у ліпені—жніўні. Адкладаюць 300—2500 яец на ніжнюю паверхню ліста. Вусені шкодзяць раслінам. Меры барацьбы: каранцін, апрацоўка раслін спец. прэпаратамі.

**АМЕРЫКА́НСКІ ГНІЛЕ́ЦЬ ПЧОЛ**, злаякасны гнілец, пячатны гнілец, інфекцыйная хвароба пчаліных сем'яў, узбуджальнік якой споратворальны мікроб (Bacillus larvae). Пашыраны ўсюды. Перадаецца праз хворых пчол, якія загінулі, праз мёд, соты, інвентар, паразітаў пчол і інш.

У пашкоджанай пчалінай сям'і расплод стракаты, рознаўзроставы. Вечкі ячэек пацямнелыя, лейкападобна ўціснутыя. Лічынкі ва ўзросце акуклівання трацяць сегментацыю, іх скурка танчэе, тканкі распадаюцца і ператвараюцца ў клейкую, цягучую масу колеру кавы, з пахам сталярнага клею. Лячэнне: цукровы сіроп з дабаўленнем сульфаніламідаў, антыбіётыкаў і інш. Прафілактыка: дэзінфіцыраванне вулляў, інвентару і інш.

**АМЕРЫКА́НСКІ ЛЕГІЁН** (American Legion), у ЗША арг-цыя былых удзельнікаў розных войнаў. Засн. ў 1919 у Парыжы вайскоўцамі амер. экспедыцыйнага корпуса ў Еўропе, узаконена як афіц. арг-цыя актам Кангрэса ЗША. Штаб-кватэра ў г. Індыянапаліс. Узначальваецца выканкомам і нац. камандорам, якіх штогод выбірае з'езд легіянераў. Выступае за сац. абарону ветэранаў войнаў, займаецца ваенна-патрыят. выхаваннем моладзі. Паліт. пазіцыі А.л. характарызуюцца антыпрафсаюзным курсам, негатыўным стаўленнем да іншаземцаў.

**АМЕРЫКА́НСКІ СО́МІК**, гл. *Сомік амерыканскі.*

**АМЕРЫКА́НСКІ ФУТБО́Л**, спартыўная гульня. Узнік у канцы 19 ст. ў ЗША на аснове *рэгбі* і *футбола*. Гуляюць 2 каманды па 11 чал. (замены па ходу сустрэчы) на працяг 4 квартаў (па 15 хвілін чыстага часу). Гал. мэта — занесці рукамі мяч грушападобнай формы ў заліковую зону і апусціць на зямлю (тачдаўн) або нагой накіраваць мяч у вароты (філдгол). Дазволены сілавыя прыёмы, для гульцоў прадугледжана спец. ахоўная амуніцыя. Найб. развіты ў ЗША, дзе штогод праводзяцца чэмпіянаты сярод прафес. клубаў; культывуецца ў 20 еўрап. краінах. Чэмпіянаты свету з 1967. На Беларусі развіваецца з 1990; клуб «Мінскія зубры» тройчы перамагаў на чэмпіянатах СНД.

*М.А.Дубіцкі.*

**АМЕРЫКА́НЦЫ**, нацыя, асн. насельніцтва ЗША. Больш за 187,2 млн. чал. (1987), у т.л. 30 млн. неграў і мулатаў. Гавораць на амерыканскім варыянце *англійскай мовы*. Паводле рэлігіі пераважна пратэстанты і католікі.

Амерыканскі футбол. Фрагмент гульні з удзелам каманды «Мінскія зубры».

**АМЕРЫ́ЦЫЙ** (лац. Americium), Am, штучны радыеактыўны хім. элемент, ат. н. 95, адносіцца да *актыноідаў*. Ста-

Аметыст.

більных ізатопаў не мае, штучна атрыманы 13, найб. устойлівы $^{243}Am$ (перыяд распаду 7370 г.).

Адкрыты ў 1944 амер. вучонымі пры апрамяненні $^{239}Pu$ нейтронамі. Серабрысты метал, шчыльн. $13{,}67 \cdot 10^3$ кг/м$^3$, $t_{пл}$ = 1173 °С. Выкарыстоўваецца ў нейтронных крыніцах, дэфектаскапіі, для атрымання больш цяжкіх элементаў (напр., плутонію, кюрыю). Высокатаксічны. Пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС (1986) ёсць на забруджаных тэр. Беларусі.

**АМЕТЫ́СТ** (ад грэч. amethystos цвярозы, не п'яны), мінерал, празрыстая фіялетавая разнавіднасць *кварцу*. Бляск шкляны. Трапляецца ў гранітных пегматытах, кварцавых жылах, пустотах вулканічных горных парод і інш. Буйныя, прыгожа афарбаваныя крышталі А. — каштоўныя камяні (ювелірныя і маст. вырабы). Радовішчы ў Замбіі,

Амеядаў мячэць. Унутраны двор.

Зімбабве, Бразіліі (найб. каштоўныя), у Расіі (Урал), Узбекістане і інш. Наладжана вытв-сць сінтэтычных А. Выкарыстоўваўся як амулет супраць п'янства.

**АМЕЯ́ДАЎ МЯЧЭ́ЦЬ**, Вялікая мячэць Амеядаў у Дамаску, помнік сярэдневяковай арабскай архітэктуры. Перабудавана ў 705—715 з царквы св. Іаана Хрысціцеля, перароблена з ант. свяцілішча Юпітэра Дамаскага.

Прамавугольнае ў плане збудаванне (157 м × 100 м) з малельнай залай, да якой прымыкае двор, абнесены з трох бакоў галерэяй з 2-ярусными аркадамі на калонах і слупах. Малельная зала — 3-нефавая з 2-ярусными аркадамі на мармуровых калонах, перакрыжавана трансептам над сяродкрыжам. Фасады ўпрыгожаны мазаікай 8 ст. (захаваліся часткова).

**АМЕЯ́ДАЎ ХАЛІФА́Т**, Дамаскі халіфат, дзяржава арабаў у перыяд праўлення халіфаў дынастыі *Амеядаў*. Сталіца — Дамаск. На пачатку займаў тэр. Аравійскага п-ва, Месапатаміі, Палесціны, Сірыі, Ірана, Егіпта. У ходзе араб. заваяванняў да халіфата далучаны Паўн. Афрыка, б.ч. Пірэнейскага п-ва, ч. Сярэдняй Азіі, некат. княствы Паўн.-Зах. Індыі, Арменія, Азербайджан, ч. Грузіі. Амеяды распаўсюджвалі сярод

заваяванага насельніцтва іслам, увялі ў справаводства араб. мову, рэарганізавалі войска (салдаты атрымлівалі плату з казны ці надзяляліся зямлёй), будавалі дарогі, каналы, караван-сараі і інш. Нестабільныя падаткі і нормы землекарыстання выклікалі нар. паўстанні (часам у форме сектанцкіх рухаў), апошняе з якіх у 747—750 пад кіраўніцтвам *Абу Мусліма* прывяло да звяржэння дынастыі Амеядаў і разбурэння халіфата.

**АМЕ́ЯДЫ**, дынастыя арабскіх халіфаў, якая правіла ў 661—750. Паходзілі з роду Амея араб. механскага плямені курэйшаў. Заснавальнік *Муавія I*, які ўзначаліў Арабскі халіфат пасля забойства апошняга з першых чатырох праведных халіфаў Алі ібн Абі Таліба.

Найб. значныя прадстаўнікі А.: Абд аль-Малік [685—705] і яго сыны Валід I [705—715], Сулейман [715—717], Ясід II [720—724], Хішам ібн Абд аль-Малік [724—743]. Пры А. створана буйная дзяржава — *Амеядаў халіфат*, працягваліся араб. заваяванні. У 750 скінуты *Абасідамі*. Адзіны ўцалелы з А. Абдарахман I уцёк у Іспанію і заснаваў там дынастыю Кардоўскіх А. (гл. *Кардоўскі эмірат*).

**АМЁБІЯЗ**, амёбная дызентэрыя, хвароба чалавека, якая выклікаецца паразітаваннем у яго арганізме дызентэрыйнай амёбы (Entamoeba histolytica) і характарызуецца язвавым пашкоджаннем тоўстага кішэчніка. Цысты ўзбуджальніка выдзяляюцца ў навакольнае асяроддзе з калам, у вадзе могуць захоўваць жыццяздольнасць да 8 месяцаў; трапляюць у арганізм праз брудныя рукі, прадметы ўжытку, забруджаную агародніну, ваду. Інкубацыйны перыяд да 1,5 месяца. Хвароба пачынаецца слабасцю, зніжэннем апетыту, болямі ў жываце. Надворак пачашчаецца да 5—15 разоў за суткі, вадкі, са слізсю і крывёй. Развіваюцца з'явы інтаксікацыі. Без лячэння магчымы пераход у хранічную форму з ускладненнямі (разрывы кішак і абсцэсы ў печані і мозгу). Лячэнне толькі ў стацыянары з наступным наглядам урача.

**АМЁБЫ** (Lobosea), клас прасцейшых. Трапляюцца ў прэсных, саленаватых, марскіх водах, часта ў прыбярэжным пяску, глебе; асобныя паразітуюць у кішэчніку жывёл і чалавека (напр., А. дызентэрыйная Entamoeba histolytica), выклікаюць *амёбіяз*.

Цела 15 мкм — 3 мм, пастаяннай формы не маюць. Перамяшчаюцца з дапамогай часовых выраставў (псеўданодыяў). Хуткасць руху 0,5—3 мкм/мін. Маюць ядро, пульсуючую і стрававальную вакуолі. Жывяцца бактэрыямі, водарасцямі, прасцейшымі. Размнажаюцца бясполым спосабам (дзяленнем). У неспрыяльных умовах акругляюцца, укрываюцца 2-слаёвай шчыльнай абалонкай (інцыстуюцца).

**А́МІ** (Ammi), род кветкавых раслін сям. сельдэрэевых. Каля 6 відаў. Пашыраны пераважна ў Міжземнамор'і. А. зубная (A. visnaga) і вялікая (A. majus) культывуюцца на Каўказе, паўд. Украіне і ў Малдове. Інтрадукаваны ў Цэнтр. бат. сад АН Беларусі.

Адна- або двухгадовыя травяністыя расліны з галінастым голым баразнаватым сцяблом выш. 50—80 см. Лісце складанаперыстарассечанае. Кветкі дробныя белыя ў складаных парасоніках. Плод — двухсямянка; мае эфірны алей, келін, віснагін, ізапімпінелін, бергаптэн і інш. біял. актыўныя рэчывы, якія выкарыстоўваюцца пры каранарнай недастатковасці, бранхіяльнай астме, коклюшы, як спазмалітычныя сродкі; прэпарат аміфурын — для лячэння віціліга і кругападобнай лысасці. Харчовыя (ужываюцца карані), меданосныя, вострапрыпраўныя і эфіраалейныя расліны.

**АМІ́ДА**, Аміда-буцу, Аміда-нёрай, адно з гал. божастваў японскай будыйскай міфалогіі; буда, уладыка запеватнай «чыстай зямлі», куды трапляюць праведнікі. Вакол А. склалася яп. разнавіднасць будызму — амідаізм.

**АМІДА́ЗЫ**, ферменты класа *гідралаз*, якія каталізуюць расшчапленне рэчываў тыпу кіслотных амідаў з утварэннем аміяку. Пашыраны ў жывых арганізмах. У ліку А. аспарагіназа (прэпарат выкарыстоўваецца ў медыцыне), глутаміназа, урэаза і інш.



Амёба: 1 — дызентэрыйная; 2 — звычайная.

**АМІДАСТАМО́З**, інвазійная нематадозная хвароба гусей (пераважна маладняку да 4 мес), качак і інш. птушак, якая выклікаецца нематодамі *амідастомамі*. Пашыраны ўсюды. Пік інвазіі ў сярэдзіне лета. Птушкі заражаюцца праз корм, абнасенены яйцамі гельмінтаў. Паказанні: запаленне слізістай абалонкі страўніка, парушэнні стрававання, кволасць, страта апетыту, хісткая хада.

**АМІДАСТО́МЫ** (Amidostomum), род нематодаў. Больш за 10 відаў. Паразітуюць у падслізістай абалонцы страўніка гусей, радзей качак, куранят і галубоў. Выклікаюць *амідастамоз*. Найб. пашырана Amidostoma anseris.

Даўж. самцоў да 14,5 мм, шыр. да 0,26 мм, самак адпаведна 20,3 і 0,39 мм. Яйцы выдзяляюцца ў вонкавае асяроддзе. Развіццё без прамежкавага гаспадара. Інвазійная лічынка пасля двухразовай лінькі пры т-ры паветра 16—26 °С праз 3—5 сутак выходзіць з яйца. У страўнік гаспадара трапляе з травой ці вадой, праз 17—22 сут дасягае палавой спеласці.

**АМІ́ДЫ КІСЛО́Т**, вытворныя кіслародазмяшчальных кіслот, у малекуле якіх гідраксільная група ОН замешчана амінагрупай $NH_2$. Нейтральныя рэчывы. А.к. неарганічныя: сульфамінавая к-та $H_2NSO_2OH$, трыамідафосфарная к-та $OP(NH_2)_3$. Да А.к. арган. належаць: *фармамід*, ацэтамід $CH_3CONH_2$, *мачавіна*, *акрыламід* і інш. Вядомы амідысульфакіслот (напр., бензолсульфамід $C_6H_5SO_2NH_2$). А.к. атрымліваюць дэгідратацыяй амоніевых соляў ці ўзаемадзеяннем аміяку або амінаў з вытворнымі адпаведных кіслот. Выкарыстоўваюцца ў вытв-сці сульфмідных прэпаратаў і поліамідаў.

**АМІ́ДЫ МЕТА́ЛАЎ**, неарганічныя злучэнні агульнай формы $M(NH_2)_n$ (M — метал, n — ступень акіслення металу). Амідысшчолачных металаў стабільныя крышт. рэчывы, цяжкіх металаў — выбухованебяспечныя. Атрымліваюць узаемадзеяннем металаў з аміякам. Амідынатрыю выкарыстоўваюцца ў вытв-сці сінт. індыга, лек. прэпаратаў (амідапірыдзінаў), вітаміну А і інш.

**АМІ́ЛАВЫЯ СПІРТЫ́**, аліфатычныя насычаныя спірты, $C_5H_{11}OH$. Вядома 8 ізамерных А.с., у т.л. ізаамілавы спірт $(CH_3)_2CHCH_2CH_2OH$ — асн. кампанент *сівушнага масла*, з якога яго і атрымліваюць. Бясколерная вадкасць з непрыемным пахам, $t_{кіп}132^{\circ}C$, шчыльн. $0,81 \cdot 10^3$ кг/м$^3$, мала растваральная ў вадзе, ядавітая. А.с. — сыравіна для вытв-сці амілацэтатаў, растваральнікі для лакафарбавых матэрыялаў, пенаўтваральнікі ў флатацыі, кампаненты ў вытв-сці пораху, лекаў і інш. Аказваюць наркатычнае дзеянне на чалавека.

Амі зубная.

**АМІЛА́ЗЫ**, ферменты, якія каталізуюць гідралітычнае раскладанне крухмалу, глікагену і інш. поліцукрыдаў на больш простыя вугляводы. Знойдзены ў слінных і падстраўнікавай залозах жывёл, праросłым насенні вышэйшых раслін, мікраарганізмах. Удзельнічаюць у працэсах стрававання, выкарыстоўваюцца пры апрацоўцы крухмалістай сыравіны для хлебапякарнай, спіртавой, піваварнай прам-сці, пры вытв-сці глюкозы і інш.

**АМІЛАПЕКЦІ́Н**, *поліцукрыд*, разгалінаваныя малекулы якога пабудаваны з астаткаў α—d-глюкозы. Уваходзіць у састаў крухмалу (звычайна 70—90%). У т.зв. воскападобных сартах кукурузы, ячменю, рысу крухмал складаецца толькі з А. Раствор А. афарбоўваецца ёдам у чырвона-фіялетавы колер.

**АМІЛАПЛА́СТЫ** (ад грэч. amylon крухмал + plastos вылеплены), бясколерныя элементы раслінnай клеткі з групы *лейкапластаў*. Сінтэзуюць і назапашваюць т.зв. другасны крухмал у назапашвальных тканках каранёў, карэнішчаў, караняплодаў (напр., бульба, батат, пастарнак і інш.).

**АМІЛАЦЭТА́ТЫ**, арганічныя рэчывы, складаныя эфіры воцатнай кіслаты і амілавых спіртоў, $CH_3COOC_5H_{11}$. Вадкасці, $t_{кіп}$ 149,2 °С, шчыльн. $0{,}875 \cdot 10^3$ кг/м$^3$ (н-амілацэтат), $t_{кіп}$ 142 °С, шчыльн. $0{,}871 \cdot 10^3$ кг/м$^3$ (ізаамілацэтат), мала растваральныя ў вадзе, добра — у арган. растваральніках. Ізаамілацэтат (грушавая эсенцыя) выкарыстоўваецца ў вытв-сці фруктовай вады, карамеляў, амілацэтат — як растваральнік лакаў і фарбаў, нітрацэлюлозы, экстрагент пры атрыманні пеніцыліну, кампаненты харч. эсенцый, рэчывы для араматызацыі мыла.

**АМІЛО́ЗА**, лінейны *поліцукрыд*, малекулы якога пабудаваны з астаткаў глюкозы. Уваходзіць у састаў *крухмалу;* у адрозненне ад другога кампанента крухмалу — *амілапекціну* ў водным асяроддзі афарбоўваецца ёдам у сіні колер.

**АМІМІ́Я** (ад *а*... + грэч. mimia перайманне), адсутнасць *мімікі* пры псіх. захворваннях, *паркінсанізме*, пашкоджанні нерваў твару.

**АМІ́Н** Хафізула (1926, г. Пагман, прав. Кабул, Афганістан — 27.12.1979), афганскі дзярж. і паліт. дзеяч. Чл. Народна-дэмакр. партыі Афганістана (фракцыя «Хальк»). Пасля пераварота (рэвалюцыі) 27.4.1978 1-ы нам. прэм'ер-міністра і міністр замежных спраў, прэм'ер-міністр. 14.9.1979 адхіліў ад улады Н.М.*Таракі*, з 16 вер. ген. сакратар ЦК партыі, старшыня Рэв. савета краіны. Імкнуўся да ўсталявання аўтарытарнага рэжыму. Загінуў у час уводу сав. войскаў у Афганістан.

**АМІНААЛЬДЭГІ́ДНЫЯ СМО́ЛЫ**, амінасмолы, тэрмарэактыўныя алігамерныя прадукты поліканденсацыі амінаў ці амідаў з альдэгідамі. Ператвараюцца ў сеткавыя палімеры. Найб. шырока выкарыстоўваюцца меламінафармальдэгідныя і мачавіна-фармальдэгідныя смолы.

Атрымліваюць у выглядзе водных растворaў ці парашкоў. Ацвярджаюцца пры награванні ці пры пакаёвай т-ры з кіслотнымі каталізатарамі. Зашытыя і мадыфікаваныя смолы — высокатрывалыя, цепла-, вода-, зносаўстойлівыя матэрыялы. Выкарыстоўваюць у вытв-сці драўнінна-стружкавых пліт, *амінапластаў*, клеяў, пенапластаў, сінт. шпону; мадыфікаваныя — у вытв-сці спец. алкідных лакаў і эмаляў, формаў і стрыжняў для алюмініевага і чыгуннага ліцця, пластыфікатараў бетону.

**АМІНАВА́ННЕ**, увядзенне амінагрупы ў малекулу арган. злучэння. Напр. $C_2H_5Cl + 2NH_3 \rightarrow C_2H_5NH_2 +$ $+ NH_4Cl$ — рэакцыя ўзаемадзеяння хлорыстага этылу з аміякам пры высокім ціску.

**АМІНАГЛІКАЗІ́ДЫ** (N-гліказіды, другасныя або трацічныя гліказіламіны), гліказіды, у малекулах якіх гліказідныя сувязі ўтвараюцца з удзелам атама азоту. А. — вытворныя гліказіміну (першасны гліказіламін), утвараюцца ў выніку замяшчэння аднаго ці двух атамаў вадароду ў амінагрупе ($-NH_2$) аліфатычнымі, араматычнымі або гетэрацыклічнымі радыкаламі. Сустракаюцца ў тканках жывёл і раслін, маюць вял.




Структурныя формулы асноўных амінакіслот.

біял. актыўнасць і выкарыстоўваюцца ў медыцыне (напр., фтарафур, цытарабін) і біялогіі. Аліфатычныя і араматычныя А. атрымліваюць кандэнсацыяй цукроў з амінамі. Да прыродных А. належаць *нуклеатыды* і *нуклеазіды*, некаторыя каэнзімы (напр., адэназінтрыфосфарная к-та, урыдзінтрыфасфат і інш.), *глікапратэіды*, амінагліказідныя антыбіётыкі, мяшаныя біяпалімеры. А. некаторых араматычных амінаў могуць быць антыаксідантамі каўчуку.

**АМІНАГРУ́ПА**, аднавалентная група атамаў — $NH_2$, характэрная для першасных *амінаў*. Мае пірамідальную будову, праяўляе ўласцівасці асноў. Уваходзіць у састаў *амінакіслот*, *амінаспіртоў*, *амідаў кіслот*.

**АМІНАКІСЛО́ТЫ**, арганічныя (карбонавыя) к-ты, якія маюць у малекуле адну або некалькі амінагруп ($NH_2$). Адрозніваюць α-А., β-А., γ-А. У прыродзе пашыраны пераважна α-А. агульнай формулы $H_2N-\underset{R}{CH}-COOH$. А. — бясколерныя крышталічныя рэчывы, большасць з якіх добра растваральцца ў вадзе. Амфатэрныя злучэнні маюць уласцівасці к-т і асноў. У жывых арганізмах знойдзена больш за 100 А., каля 20 з іх асн. структурныя элементы малекул бялкоў. Іншыя А. ўваходзяць у састаў ферментаў, гармонаў, некаторых антыбіётыкаў, вітамінаў і інш. рэчываў, неабходных для жыццядзейнасці арганізма. Могуць быць у тканках жывых арганізмаў у свабодным стане. Біял. роля і функцыі некаторых А. не высветлены. Шэраг А. (*арніцін*, цыстатыянін і інш.) — прамежкавыя прадукты абмену рэчываў.

У большасці прыродных А. амінагрупа звязана з вугляродам, самым блізкім да карбаксільнай групы; у малекуле β-А. яна звязана з другім пасля карбаксільнай групы вугляродам. α-А. падзяляецца на ацыклічныя (тлустага шэрагу) і цыклічныя (араматычнага шэрагу); па колькасці аміна- і карбаксільных груп у малекуле α-А. адрозніваюць монаамінамонакарбонавыя, напр. *гліцын*, *серын*, *трэанін*; монаамінадыкарбонавыя, напр. *аспарагінавая кіслата*, глутамінавая кіслата; дыамінамонакарбонавыя к-ты, напр. *лізін*, *аргінін*. У прыродзе большая частка α-А. сінтэзуецца раслінамі, некаторыя з іх (заменныя А.) могуць сінтэзавацца і жывёльнымі арганізмамі з неарган. злучэнняў азоту, напр. аміяку і кетонакіслот. Незаменныя А. (*валін*, *лейцын*, *ізалейцын*, лізін, *трыптафан*, *фенілянін*, *метыянін*, *трэанін* і інш.) у чалавека і жывёл не ўтвараюцца і паступаюць у арганізм з ежай. Ад нястачы іх у арганізме ўзнікаюць розныя хваробы.

Атрымліваюць і сінтэтычна, у т.л. ва ўмовах, якія мадэліруюць атмасферу першабытнай Зямлі. А. выкарыстоўваюць у медыцыне, для павышэння біял. каштоўнасці некаторых харч. прадуктаў, як зыходныя прадукты ў прамысл. сінтэзе поліамідаў, фарбавальнікаў.

**АМІНАПЕПТЫДА́ЗЫ**, група ферментаў кішачнага соку. Удзельнічаюць у працэсах стрававання. Каталізуюць гідралітычнае расшчапленне поліпептыдаў (прадуктаў расшчаплення бялкоў) з утварэннем свабодных амінакіслот. Расшчапленне ажыццяўляецца толькі з таго канца поліпептыднага ланцуга, дзе ёсць свабодная амінагрупа ($NH_2$).

**АМІНАПЛА́СТЫ**, пластмасы на аснове *амінаальдэгідных смол*. Вырабляюцца ў выглядзе прэс-парашкоў, слаістых пластыкаў ці сіставатых матэрыялаў. Прэс-парашкі маюць у якасці напаўняльнікаў драўнінную і кварцавую муку, каалін; слаістыя пластыкі — ніткі, жгуты, тканыя і нятканыя палотны, азбест, паперу. Не маюць паху, стойкія да дзеяння слабых кіслот і шчолачаў, ацэтону, спірту, цепла-, святло- і водаўстойлівыя, дыэлектрыкі. Выкарыстоўваюцца ў вытв-сці электратэхн. вырабаў (карпусы прылад, ізаляцыйныя матэрыялы), пластыкаў для мэблі і інтэр'ераў, драўнінна-стружкавых пліт, цепла- і гукаізаляцыйных матэрыялаў.

**АМІНАСПІРТЫ́**, арганічныя аліфатычныя злучэнні, малекула якіх мае амінагрупу $NH_2$ і гідраксільную групу OH; $C_nH_{2n}(NH_2)OH$. Масляністыя вадкасці з уласцівасцямі асноў. З мінер. і моцнымі карбонавымі кіслотамі ўтвараюць крышт. солі, з вышэйшымі тлустымі кіслотамі і іх эфірамі — нейтральныя прадукты (мыла). Атрымліваюць дзеяннем аміяку або амінаў на аксіды алефінаў. Выкарыстоўваюцца (асабліва этаноламіны) у вытв-сці мыйных сродкаў, эмульгатараў, касметычных і лек. прэпаратаў. Да вытворных А. належаць эфедрын, гармон L-адрэналін і халін, якія адыгрываюць важную ролю ў абмене рэчываў жывых арганізмаў.

**АМІНАТАЛУО́ЛЫ**, гл. *Талуідзіны*.

**АМІНАТРАНСФЕРА́ЗЫ**, трансаміназы, ферменты, якія зваротна каталізуюць перанос амінагрупы ($-NH_2$) ад *амінакіслот* на *кетакіслоты* без прамежкавага ўтварэння аміяку. Рэакцыі з удзелам А. забяспечваюць сувязь бялкавага і вугляводнага абменаў ў жывых арганізмах. Вызначэннем актыўнасці асобных А. карыстаюцца ў дыягностыцы хвароб нырак, сэрца.

**АМІНАФЕНО́ЛЫ**, арганічныя араматычныя злучэнні, малекула якіх мае амінагрупу $NH_2$ і гідраксільную групу OH; $C_6H_4(NH_2)OH$. Вядомы крышталічныя ізамеры А., орта-А., $t_{пл}$ 174 °С; мета-А., $t_{пл}$ 123 °С і пара-А., $t_{пл}$ 186 °С. Амфатэрныя, утвараюць солі з кіслотамі і шчолачамі. Атрымліваюць аднаўленнем адпаведных нітроза- і нітрафенолаў. Ізамеры (мета- і пара-А.) выкарыстоўваюць у вытв-сці фарбавальнікаў для футра (карычневы колер), пара-А. і яго вытворныя — праявіцелі ў фатаграфіі. А. могуць выклікаць дэрматыт.

**АМІНАЦУ́КРЫ**, вытворныя простых *монацукрыдаў* (гексоз), у якіх адна або некалькі гідраксільных груп (OH) заменены амінагрупамі ($NH_2$). Найб. пашыраны ў прыродзе d-глюкозамін (гал. кампанент *хіціну*, які ўтварае вонкавы шкілет насякомых і ракападобных) і d-галактазамін (уваходзіць у састаў глікаліпідаў, гал. поліцукрыду храсткоў — хондраітынсульфату). Выкарыстоўваюцца ў хім., хім.-фармацэўтычнай, тэкст. прам-сці.

**АМІ́НЫ**, азотазмяшчальныя арган. злучэнні; вытворныя аміяку, у якіх атамы вадароду замешчаны арган. радыкаламі. Па колькасці замешчаных атамаў адрозніваюць А. першасныя $RNH_2$, другасныя $R_2NH$, трацічныя $R_3N$, па колькасці амінагруп — мона-, ды-, тры- і поліаміны. Ніжэйшыя А. — газы, вышэйшыя — вадкасці ці цвёрдыя рэчывы. А. — асновы, з кіслотамі ўтвараюць солі, растваральцца ў вадзе. Атрымліваюць звычайна алкіліраваннем аміяку, аднаўленнем нітразлучэнняў, нітрылаў. Выкарыстоўваюцца ў вытв-сці фарбавальнікаў, лекаў, палімерных матэрыялаў, флотарэагентаў, паверхнева-актыўных і роставых рэчываў, гербіцыдаў; уваходзяць у састаў біялагічна актыўных рэчываў, амінакіслот, нуклепратэідаў, ферментаў.

**АМІ́Р ХАСРО́Ў ДЭХЛЕВІ́** (1253, г. Пацыяла, штат Хар'яна, Індыя — 1325), індыйскі паэт, вучоны, музыкант. Пісаў на урду, перс. і хіндзі мовах. Яго лірыка сабрана ў 5 дыванах: «Дар юнацтва» (1272), «Сярэдзіна жыцця» (1284), «Паўната дасканаласці» (1293), «Выбраны астатак» (1316), «Мяжа дасканаласці» (1325). На ўзор «Пяцерыцы» Нізамі, абапіраючыся на інд. фальклор, стварыў цыкл з 5 паэм: «Узыходжанне свяцілаў», «Шырын і Хасроў», «Меджнун і Лейла» (усе 1298), «Іскандэрава зярцала» (1299), «Восем райскіх садоў» (1301). Складаў тэсніфы (нар. рамансы). Яму прыпісваюць зборнікі вершаў, загадак, прыказак, слоўнік сінонімаў.

*Тв.*: Рус. пер. — Хамса. Маджнун и Лайли: Поэма. М., 1975; Хамса. Матла'ал-анвар: Поэма. М., 1975; Избр. газели. М., 1980.

**АМІРАБА́ДСКАЯ КУЛЬТУ́РА**, археалагічная культура плямёнаў эпохі позняй бронзы (9—8 ст. да н.э.), што жылі на тэр. Стараж. Харэзма (нізоўе р. Амудар'я). Назва ад стаянак у раёне канала Амірабад (Каракалпакія). Насельніцтва займалася земляробствам і жывёлагадоўляй. Жыло на паселішчах з 15—20 прамавугольных паўзямлянак. Для іх керамікі характэрна плоскае дно і акруглая форма тулава. На паселішчы Яке-Парсан-2 знойдзены бронзавыя наканечнікі стрэл, сярпы і формы для іх адліўкі.

**АМІРАНАШВІ́ЛІ** Медэя Пятроўна (н. 10.9.1930, Тбілісі), грузінская спявачка (сапрана), педагог. Нар. арт. Грузіі (1965), нар. арт. СССР (1976). Дачка П.В.*Аміранашвілі*. Скончыла Тбіліскую

кансерваторыю (1953), выкладае ў ёй (з 1982 праф.). З 1954 салістка Груз. т-ра оперы і балета. Сярод лепшых партый: Маро («Даісі» З.Паліяшвілі), Мзія («Міндыя» А.Такгакішвілі), Таццяна («Яўген Анегін» П.Чайкоўскага), Чыо-Чыо-сан («Чыо-Чыо-сан» Дж.Пучыні). Лаўрэат Усесаюзнага конкурсу вакалістаў імя Глінкі (1960), Міжнар. конкурсу «Мадам Батэрфляй» (Осака, 1970). Дзярж. прэмія Груз. ССР 1971.

**АМІРАНАШВІ́ЛІ** Пётр (Петрэ) Варламавіч (16.11.1907, с. Нігаіты Ланчхуцкага р-на, Грузія — 26.12.1976), грузінскі спявак (барытон). Нар. арт. СССР (1950). Бацька М.П.*Аміранашвілі*. Пасля сканчэння Тбіліскай кансерваторыі (1930) саліст Грузінскага т-ра оперы і балета. Сярод партый: Кіазо («Даісі» З.Паліяшвілі), Аўтандзіл («Сказанне аб Тарыэлі» Ш.Мшвелідзе, Дзярж. прэмія СССР 1947), Князь Ігар («Князь Ігар» А.Барадзіна), Яга («Атэла» Дж.Вердзі).

**АМІРА́НІ**, герой стараж. грузінскага нар. эпасу «Аміраніяні», які вучыць людзей, як здабываць агонь і апрацоўваць метал, вызваляе іх ад міфічных пачвар — дэваў. Бог жорстка карае А., прыкаваўшы да скалы Каўказскіх гор. Міф пра А. блізкі да міфаў пра *Абрскіла* і *Праметэя*.

**АМІРА́НЦКІЯ АСТРАВЫ́** (Amirantes Islands), архіпелаг нізінных каралавых а-воў (каля 150) у Індыйскім ак., на ПнУ ад в-ва Мадагаскар, тэр. дзяржавы Сейшэльскія Астравы. Пл. каля 85 км$^2$. Плантацыі какосавых пальмаў. Лоўля рыбы і чарапах. Адкрыты ў 1502 партугальцамі, названы ў гонар мараплаўца адмірала Васка да Гамы.

**АМІ́РАЎ** Фікрэт Мешады Джаміль аглы (22.11.1922, г. Гянджа — 20.2.1984), азербайджанскі кампазітар. Нар. арт. СССР (1965). Чл.-кар. АН Азербайджана (1980). Герой Сац. Працы (1982). Аўтар першых нац. лірыка-псіхал. оперы «Севіль» (1953) і сімф. мугамаў «Шур» і «Кюрд-аўшары» (1948), якія паўплывалі на развіццё сімфанізму ў Азербайджане і інш. краінах Усходу.

Сярод інш. твораў: опера «Улдуз» (1948); балеты «Насімі» (1973), «Тысяча і адна ноч» (1979); муз. камедыі «Выкрадальнікі сэрцаў» (1944), «Добрая вестка» (1946); Сімфонія Нізамі (1947); сімф. і арк. творы, рамансы, апрацоўкі нар. песень, музыка да драм. спектакляў і кінафільмаў. Аўтар кн. «Музычныя роздумы» (1971), «Музычныя старонкі» (1978) і інш. Дзярж. прэміі СССР 1949 і 1980; Дзярж. прэмія Азербайджана 1974.

*Літ.*: Виноградов В. Мир музыки Фикрета. Баку, 1983.

**АМІРДАЎЛА́Т** Амаснацы (1420 або 1425 — 1496), армянскі ўрач. Аўтар працы «Карысць медыцыны» (1469) пра анатамічныя, фізіялагічныя, гігіенічныя веды; таксама даецца апісанне хвароб, якія былі вядомы сярэдневяковай медыцыне. У працы «Непатрэбнае для невукаў» (1482) прыведзена каля 3000 назваў лек. сродкаў на 6 мовах у алфавітным парадку.

**АМІРХА́Н** Фатых Зарыфавіч (13.1.1886, Казань — 9.3.1926), татарскі пісьменнік. Заснаваў прагрэсіўную газ. «Эль-іслах» («Рэформа», 1907—09). Аўтар аповесцяў «Татарская дзяўчына», «Фатхула хазрат» (абедзве 1909), «На раздарожжы» (1912), драмы «Моладзь» (1910) і інш. Змагаўся за рэаліст. мастацтва, выступаў супраць перажыткаў феадалізму, паказваў імкненне тат. моладзі да новага жыцця.

**АМІРЭДЖЫ́БІ** Чабуа (Мзечабук) Іракліевіч (н. 18.11.1921, Тбілісі), грузінскі пісьменнік. Вучыўся ў Тбіліскім пед. ін-це. Аўтар зб-каў апавяданняў «Дарога» (1962), «Кошт перавалу» (1966), «Кроплі мёду» (1968), аповесці «Міска дзядзькі Шата» (1965). У рамане «Дата Туташхія» (кн. 1—2, 1973—75; сцэнарый фільма «Берагі», 1980, Дзярж. прэмія СССР 1981) адлюстраваны жыццё Грузіі канца 19 — пач. 20 ст. і актуальныя маральна-этычныя праблемы.

Амія.

**АМІТО́З** (ад *a*... + *мітоз*), прамое дзяленне ядра, адзін са спосабаў дзялення клеткі. Упершыню апісаў ням. біёлаг Р.Рэмак (1841); тэрмін прапанаваў ням. гістолаг В.Флемінг (1882). Адбываецца праз падзел ядзерца з наступнай перацяжкай усяго цела ядра без утварэння храмасом і ахрамацінавага верацяна. Пры А., у адрозненне ад *мітозу*, не забяспечваецца раўнамернае размеркаванне генет. матэрыялу кожнай храмасомы паміж дзвюма дачкінымі клеткамі. Часам пры дзяленні ядра ў ходзе А. ўтвараюцца многаядзерныя клеткі. А. уласцівы некаторым прасцейшым, а таксама клеткам спец. тканак (напр., храстковай, злучальнай) і паталагічных разрастанняў, у прыватнасці пухлінных.

**АМІТО́Н** Аляксандр Навумавіч (20.12.1911, г. Марыупаль — 6.5.1969), бел. скрыпач і педагог. Засл. арт. Беларусі (1940). Праф. (1947). Скончыў Маскоўскую кансерваторыю (1935). У 1937—51 выкладаў у Бел. кансерваторыі. Выступаў як саліст і ансамбліст, меў у рэпертуары і творы бел. кампазітараў. Лаўрэат Усесаюзнага конкурсу скрыпачоў, віяланчэлістаў і піяністаў (1937—38). Пасля 1951 працаваў у Грузіі і Расіі.

**АМІ́ЧНАЕ СУПРАЦІЎЛЕ́ННЕ**, фізічная велічыня, якая характарызуе супраціўленне ланцуга (яго ўчастка) пастаяннаму току; былая назва гранічнага значэння актыўнага супраціўлення (гл. *Электрычнае супраціўленне*). Абумоўлена неабарачальным пераўтварэннем эл. энергіі ў інш. формы (пераважна ў цеплавую); пацвярджае выкананне *Ома закону* для дадзенага ўчастка ланцуга.

**АМІ́ЧЫ** (Amici) Джавані Батыста (25.3.1786, г. Мадэна, Італія — 10.4.1863), італьянскі батанік і оптык. Скончыў Балонскі ун-т (1808). Праф. матэматыкі Мадэнскага (1818—25), астраноміі Пізанскага (1831—35) ун-таў, дырэктар абсерваторыі ў Фларэнцыі (з 1835). Упершыню апісаў рух пратаплазмы ў расліннай клетцы і пылковую трубку (1823), адкрыў у зародкавым мяшку «зародкавы пузырок» (яйцаклетку) і назіраў за пераўтварэннем яйцаклеткі ў зародак (1843). Вынайшаў імерсійны аб'ектыў мікраскопа (1827).

**А́МІЯ**, глейная рыба (Amia calva), рыба атрада аміяпадобных. Адзіны сучасны рэліктавы прадстаўнік атрада Amiiformes. Жыве ў неглыбокіх стаячых забалочаных вадаёмах Паўн. Амерыкі на Пд ад Вялікіх азёр.

Даўж. да 90 см. Цела акруглае, рыла кароткае. Восевы шкілет акасцянелы, на галаве скурныя косці (адзнака прымітыўных рыб). Луска цыкloідная; спінны плаўнік доўгі, хваставы — сіметрычны, круглаваты. Можа дыхаць атм. паветрам. Драпежнік.

**АМІЯ́К**, $NH_3$, найпрасцейшае хім. злучэнне азоту з вадародам. Бясколерны газ з рэзкім удушлівым пахам, $t_{кіп}$ -36 °С, шчыльн. у вадкім стане $0{,}681 \cdot 10^3$ кг/м$^3$, растваральны ў вадзе (10%-ны раствор — нашатырны спірт). Растварае шчолачныя і шчолачна-зямельныя металы, некаторыя неметалы (P, S, I), многія арган. і неарган. рэчывы. Атрымліваюць каталітычным узаемадзеяннем $N_2$ і $H_2$ пад ціскам. Выкарыстоўваецца для вытв-сці азотнай кіслаты, мачавіны, азотазмяшчальных соляў, соды, угнаенняў, а таксама ў медыцыне. Вадкі А. і яго растворы — холадарэагенты. Ядавіты, выклікае слёзацячэнне, удушша, болі ў страўніку. ГДК 20 мг/м$^3$.

**АМІЯКА́ТЫ**, 1) прадукты далучэння *аміяку* да соляў; комплексныя злучэнні. Аміяк у А. звязаны каардынацыйна з іонам металу і ўваходзіць ва ўнутр. сферу комплексу, напр. $[Pt(NH_3)_6]Cl_4$, $[Cu(NH_3)_4]Cl_2$. Утвараюць большасць металаў. Устойлівасць А. у водных растворах вызначаецца канстантамі нястойкасці. Атрымліваюць дзеяннем аміяку на водныя растворы соляў. Многія А. афарбаваныя і выкарыстоўваюцца ў аналіт. хіміі для раздзялення металаў. 2) Вадкія *азотныя ўгнаенні* з колькасцю азоту да 45%.

**АМІЯ́Н МАРЦЭЛІ́Н** (Ammianus Marcellinus; каля 330 — каля 400), рымскі гісторык. Па паходжанні грэк. У 363 удзельнічаў у ваен. паходзе імпера-

тара *Юліяна Адступніка* ў Персію. Асноўны гіст. твор «Дзеянні» (задуманы як працяг «Аналаў» і «Гісторый» Тацыта), ахоплівае перыяд ад праўлення імператара Нервы [96—98] да 378. З 31 кнігі захаваліся 18 (14—31-я). У іх апісаны падзеі 353—378: войны, барацьба за ўладу, перыяд заняпаду Рым. імперыі, сац. рух 4 ст., барацьба еўрапейскіх плямёнаў з Рымам. Акрамя пісьмовых крыніц выкарыстаў асабістыя назіранні і паведамленні сведак.

*Тв.*: Рус. пер. — История. Вып. 1—3. Киев, 1906—08.

**АМІЯ́ЧНАЯ ВАДА́**, раствор аміяку (18—25%) у вадзе. Празрыстая, з жаўтаватым адценнем вадкасць з рэзкім пахам. Шчыльн. 18—25%-нага раствору (0,930—0,910)·10 кг/м$^3$. Атрымліваюць растварэннем сінт. аміяку ў вадзе ці паглынаннем яго вадой з адыходных газаў коксахім. вытв-сці. Выкарыстоўваецца ў вытв-сці фарбавальнікаў, соды, марганцу, ферасплаваў, як азотнае ўгнаенне і для аманізацыі кармоў у сельскай гаспадарцы.

**АМІЯ́ЧНАЯ САЛЕ́ТРА**, гл. ў арт. *Салетры*.

**«АМКАДО́Р»**, канцэрн, акц. т-ва на Беларусі па вырабе дарожна-буд. тэхнікі. Створаны ў 1993. Уключае больш за 80 прадпрыемстваў і ўстаноў: спец. КБ «Дармаш», доследна-эксперым. з-д, з-ды «Ударнік», «Дармашмет», «Агрэгат», «Унімод», «Унікаб», «Амкадор-Мота», «Усяж», «Амкадор-Пінск» і інш. Мае таксама прадпрыемствы ў Расіі, Польшчы, Балгарыі і інш. Асн. прадукцыя: пагрузчыкі аднакаўшовыя франтальныя, бульдозеры-пагрузчыкі, экскаватары-пагрузчыкі, дарожныя каткі, снегаачышчальнікі, аўтобусы, машыны для лесапрамысл. комплексу і камунальнай гаспадаркі, прычэпы для легкавых аўтамабіляў, мэбля, інструмент, электратавары, швейныя вырабы і інш.

*В.М.Шлындзікаў.*

**АМНАКА́Н**, рака паміж Кітаем і КНДР, гл. *Ялуцзян*.

**АМНЕЗІ́Я** (ад *a*... + грэч. mnesis успамін), адсутнасць успамінаў, аслабленне памяці. Нармальная А. ў першыя 2—3 гады жыцця дзіцяці абумоўліваецца недаразвіццём кары галаўнога мозга, паталагічная А. бывае пры псіх. хваробах, траўмах галавы, атручэннях і парушэннях свядомасці. Пры частковай А. з памяці выпадаюць некат. віды і ўяўленні, пры рэтраградной — падзеі пэўнага часу (гадзіны, дні, месяцы), якія папярэднічалі хваробе. Пры антэраградной А. забываюцца падзеі, што адбыліся пасля хваробы ці вострага парушэння свядомасці, а пры А., якая прагрэсіруе, забываецца найперш тое, што было нядаўна.

**АМНІЁН** (грэч. amnion), адна з зародкавых абалонак *амніётаў*. Утварае запоўненую вадкасцю поласць — асяроддзе для развіцця зародка, ахоўвае яго ад мех. пашкоджанняў. Падобную да А. абалонку маюць некаторыя насякомыя, немертыны і інш. беспазваночныя.

**АМНІЁТЫ** (Amniota), група першасна-наземных пазваночных жывёл (паўзуны, птушкі і млекакормячыя), у якіх на ранніх стадыях развіцця паяўляюцца асобныя зародкавыя абалонкі, у т.л. *амніён* (адсюль назва). У адрозненне ад *анамній* у А. зародак развіваецца ў яйцы (паўзуны, птушкі) або ў матцы самкі (млекакормячыя). Размнажаюцца і развіваюцца на сушы.

**АМНІ́СТЫЯ** (ад грэч. amnēstia забыццё, дараванне), вызваленне ад крымін. адказнасці, замена назначанага судом пакарання больш мяккім або зняцце *судзімасці*. Ажыццяўляецца на аснове акта вышэйшага прадстаўнічага органа дзярж. улады ці кіраўніка дзяржавы. Можа быць агульнай для ўсіх асоб, засуджаных або прыцягнутых да крымін. адказнасці па шэрагу артыкулаў крымін. закону, або частковай (адносіцца да асоб, якія ўчынілі злачынствы толькі пэўнай катэгорыі). Права А. ў Рэспубліцы Беларусь мае Вярх. Савет. Ад А. адрозніваюць *памілаванне*.

Амон у вобразе барана, які ахоўвае фараона Тахарку. Напат. 8 ст. да н.э.

**АМНІ́СТЫЯ МІЖНАРО́ДНАЯ** (Amnesty International), міжнар. праваахоўная няўрадавая арганізацыя. Створана ў 1961 у Лондане. Мае філіялы ў 44 краінах свету, прадстаўлена індывід. членамі ў 155 краінах і тэрыторыях (1994). Асн. мэты: юрыд. дапамога зняволеным за паліт. і рэліг. перакананні («нявольнікам сумлення») і іх сем'ям. Выступае супраць катаванняў і смяротнай кары, рыхтуе незалежныя даклады аб парушэннях правоў чалавека. Кіруючыя органы — сесія (склікаецца штогод), выканаўчы камітэт, сакратарыят. Штаб-кватэра ў Лондане. Нобелеўская прэмія міру 1977.

**АМО́ГРАФЫ** [ад *гама*... + ...*граф*(ы)], словы або іх формы, якія аднолькава пішуцца, але адрозніваюцца гучаннем (націскам) і значэннем. Напр.: «ка́са—каса́», «а́тлас—атла́с», «му́ка—мука́». А. можна адрозніць толькі ў кантэксце.

**«АМО́КА»** (Amoco), нафтавая манаполія ЗША. Засн. ў 1889, да 1985 наз. «Стандарт ойл компані (Індыяна)». Здабыча нафты 40 млн. т за год, з іх 45% у ЗША, перапрацоўка 44,1 млн. т (1988).

**АМО́Н**, у старажытнаегіпецкай міфалогіі бог сонца. Лічыўся апекуном г. Фівы. А. разам з жонкай, багіняй неба Мут, і сынам, богам месяца Хансу, складалі т.зв. фіванскую трыяду. А. уяўляўся ў выглядзе чалавека (часам з галавой барана) у кароне з двума высокімі пёрамі і сонечным дыскам; шанаваўся як мудры бог, нябесны заступнік, абаронца прыгнечаных.

**АМОНАІДЭ́І** (Ammonoidea), выкапнёвыя малюскі; гл. *Аманіты*.

**АМО́НІЙ**, амонію катыён, складаны катыён агульнай формулы $[RR^1NR^2R^3]^+$, дзе R, $R^1$, $R^2$, $R^3$ — вадарод, алкіл, арыл. Катыён $[NH_4]^+$, які існуе ў водных растворах аміяку, у саставе малекул неарган. і арган. злучэнняў адыгрывае ролю аднавалентнага металу, напр. гідраксід амонію ($NH_4OH$), сульфат амонію $[(NH_4)_2SO_4]$, ацэтат амонію ($CH_3COONH_4$) і інш. А. з алкіл- і арыл-радыкаламі — катыён амоніевых соляў (гл. *Амонію злучэнні*).

**АМО́НІМАЎ СЛО́ЎНІК**, аспектны даведнік, які апісвае пары і групы амонімаў. У артыкулах А.с. падаюцца семантычныя, граматычныя, спалучальныя, стылістычныя і інш. адрозненні паміж словамі ў аднолькавых парах і групах амонімаў (у адрозненне ад інш. слоўнікаў, дзе загаловачнае слова-амонім толькі пазначаецца надрадковай арабскай лічбай). Напр., «Слоўнік амонімаў беларускай мовы» В.Дз.Старычонка (1991) змяшчае 1265 аманімічных пар і груп слоў у асн. частцы і больш як 750 у раздзеле «Субстантыўная аманімія». Для практычнага вырашэння праблем міжмоўнай аманіі (і паранімії) створаны спец. слоўнік дыферэнцыяльнага тыпу: «Кароткі дыферэнцыяльны руска-беларускі слоўнік» у кн. «Беларуская мова для небеларусаў» А.А.Крывіцкага, А.Я.Міхневіча і А.І.Падлужнага (3-е выд., 1990), «Міжмоўныя амонімы і паронімы. Спроба руска-беларускага слоўніка» С.М.Грабчыкава (1980), «Беларуска-рускі паралексічны слоўнік-даведнік» (1985) і інш.

*В.К.Шчэрбін.*

**АМО́НІМЫ** (ад *гама* + грэч. onyma імя), словы, што супадаюць у гучанні і напісанні, але маюць рознае значэнне. Гл. ў арт. *Аманімія*.

**АМО́НІЮ ЗЛУЧЭ́ННІ**, хімічныя злучэнні з зараджаным атамам азоту (амонію катыёнам), які кавалентна звязаны з вадародам ці арган. радыкаламі і іон-

най сувяззю з аніёнам. Найпрасцейшыя н е а р г а н і ч н ы я А.з. — гідраксід амонію ($NH_4OH$) і солі амонію: хлорысты амоній ($NH_4Cl$), нітрат амонію ($NH_4NO_3$) і інш. Гідраксід амонію атрымліваюць растварэннем аміяку ў вадзе; пры дысацыяцыі праяўляе ўласцівасці слабай асновы. Большасць соляў амонію растваральна ў вадзе, дысацыіруюць, гідралізуюцца, пры награванні раскладаюцца. Гідроліз і тэрмічнае раскладанне іх залежыць ад прыроды аніёна, напр. $NH_4Cl$ раскладаецца па схеме: $NH_4Cl=NH_3+HCl$; у солях з аніёнам-акісляльнікам адбываецца акісляльна-аднаўляльны працэс, напр. $NH_4NO_3=N_2O+2H_2O$. Солі амонію маюць шырокае выкарыстанне: хлорысты амоній — у сухіх батарэях, як флюс для пайкі і зварвання металаў, дымаўтваральнік; сульфат і нітрат — азотныя ўгнаенні, нітрат — кампанент выбуховых рэчываў; гідракарбанат амонію выкарыстоўваецца ў кандытарскай вытв-сці. Да а р г а н і ч н ы х А.з. належаць першасныя $[RNH_3]^+X^-$, другасныя $[R_2NH_2]^+X^-$, трацічныя $[R_3NH]^+X^-$ і чацвярцічныя амоніевыя солі $[R_4N]^+X^-$, унутраныя чацвярцічныя амоніевыя солі, напр. бетанін $(CH_3)_3N^+CH_2COO^-$, *оніевыя злучэнні* з атамам азоту. Найб. распаўсюджаныя чацвярцічныя амоніевыя солі, якія атрымліваюць *алкіліраваннем* (кватэрнізацыяй) трацічных амінаў. Злучэнні хоць з адным доўгім алкільным радыкалам валодаюць паверхнева-актыўнымі і антысептычнымі ўласцівасцямі. Выкарыстоўваюцца як эмульгатары, стабілізатары, змочвальнікі, дэзінфекцыйныя сродкі, лек. прэпараты (метацын, кватэрон), пры амыленні тлушчаў. Сустракаюцца ў прыродзе ў раслінах (алкалоіды); халін, ацэтылхалін — фізіялагічна актыўныя рэчывы.

*Літ.*: Общая органическая химия. Т. 3. М., 1982.

**АМО́РФНЫ СТАН** (ад *a*... + грэч. morphē форма), няўстойлівы стан цвёрдага рэчыва, характэрная асаблівасць якога — адсутнасць строгай паўтаральнасці структурных элементаў (неўпарадкаванасць размяшчэння атамаў і малекул) і натуральная *ізатрапія* яго фіз. уласцівасцяў. Аморфныя цвёрдыя целы павольна крышталізуюцца, не маюць пастаяннай т-ры плаўлення (пры павышэнні т-ры размякчаюцца). Уласцівы многім прыродным (бурштын, смолы) і штучным (плаўлены кварц, шкло, пластмасы і інш.) рэчывам.

**АМО́РФНЫЯ МО́ВЫ**, тое, што *кораніезаляваныя мовы*.

**АМО́САЎ** Мікалай Міхайлавіч (н. 6.12.1913, с. Альховае Валагодскай вобл., Расія), украінскі хірург. Акад. АН Украіны (1969), чл.-кар. АМН СССР (1961), засл. дз. нав. Украіны (1959), Герой Сац. Працы (1973). Скончыў Архангельскі мед. ін-т (1939). З 1952 узначальваў клініку грудной хірургіі, з 1983 дырэктар Ін-та сардэчна-сасудзістай хірургіі ў Кіеве. Навук. працы па пытаннях хірургіі сэрца і лёгкіх, біял. і мед. кібернетыцы. Пад яго кіраўніцтвам распрацавана дыягностыка парокаў сэрца з дапамогай ЭВМ, створана дзеючая фізіял. мадэль «унутранага асяроддзя арганізма» чалавека і інш. Аўтар літ. тв. «Думкі і сэрца» (1965), «Запіскі з будучыні» (1967) і інш. Ленінская прэмія 1961, Дзярж. прэмія Украіны 1978.

*Тв.*: Операции на сердце с искусственным кровообращением. Киев, 1962 (разам з І.Л.Лісавым, Л.М.Сідарэнка); Хирургия пороков сердца. Киев, 1969 (разам з Я.А.Бендэтам); Физическая активность и сердце. 2 изд. Киев, 1984 (з ім жа).

**АМПЕЛАГРА́ФІЯ** (ад грэч. ampelos вінаград + ...*графія*), навука, якая вывучае віды і сарты *вінаграду*. Складаецца з А. агульнай, што вывучае сістэматыку, паходжанне, пашырэнне і зменлівасць відаў і сартоў, методыку даследаванняў, і А. спецыяльную, якая ўключае бат. апісанне сартоў, іх біял. і с.-г. харак-



Ампера закон.

тарыстыкі, уласцівасці і раянаванне. Ампелаграфічная калекцыя створана ў Крыме (да 1000 сартоў). Ампелаграфічная праца вядзецца амаль ва ўсіх вінаградна-вінаробных краінах.

**АМПЕЛАТЭРАПІ́Я** (ад грэч. ampelos вінаград + *тэрапія*), в і н а г р а д а л я ч э н н е, выкарыстанне пладоў і соку вінаграду ў лек. мэтах. Вядома са старажытнасці, у Расіі з канца 19 ст. Практыкуецца ў зонах вінаградарства, звычайна ў спалучэнні з клімататэрапіяй. Лепшыя лек. сарты — Шасла, Рыслінг, Семільён, Гауш, Акішміш, Тагузюм чэлекі. Асн. станоўчы ўплыў А. звязаны з багаццем і разнастайнасцю ў спелых пладах і соку вінаграду вугляводаў, пекцінавых і мінер. рэчываў, вітамінаў; выяўляецца праз нармалізацыю і актывацыю абменных працэсаў (асабліва водна-салявога абмену), апетыту, сакрэцыі страўніка, маторыкі кішэчніка, функцый мочавыдзялення і інш. Проціпаказана пры цукр. дыябеце, вострых захворваннях, язве страўніка, гіпертаніі, хранічных паносах і абвастрэннях туберкулёзу. Дозы спажывання пладоў вінаграду пры А. могуць дасягнуць 2 кг, соку — 1,2 л за суткі.

**АМПЕ́Р** (Ampère) Андрэ Мары (22.1.1775, г. Ліён, Францыя — 10.6.1836), французскі фізік і матэматык, адзін з заснавальнікаў класічнай электрадынамікі. Чл. Парыжскай (1814), замежны ганаровы чл. Пецярбургскай (1830) і інш. АН. Атрымаў дамашнюю адукацыю. З 1805 у Політэхн. школе ў Парыжы (з 1809 праф.), з 1824 праф. Калеж дэ Франс. Сфармуляваў правіла для вызначэння напрамку адхілення магн. стрэлкі токам (правіла А.); адкрыў законы ўзаемадзеяння эл. токаў і эл. току з магн. полем (гл. *Ампера закон*). Пабудаваў тэорыю магнетызму, у аснове якой ляжыць гіпотэза пра кругавыя эл. токі, эквівалентныя плоскім элементарным магнітам.

М.М.Амосаў.

А.М.Ампер.

Аўтар прац па тэорыі імавернасцяў, па дастасаванні варыяцыйнага вылічэння да задач механікі, па пытаннях матэм. аналізу. Вынайшаў камутатар і эл.-магн. тэлеграф.

*Літ.*: Г о л и н Г.М., Ф и л о н о в и ч С.Р. Классики физической науки (с древнейших времён до начала XX в.). М., 1989. С. 313—324.

**АМПЕ́Р** (А), 1) адзінка сілы эл. току; адна з сямі асн. адзінак Міжнар. сістэмы адзінак (СІ). Названы ў гонар А.М.*Ампера*. А. — сіла нязменнага току, які пры праходжанні па двух бясконцых прамалінейных паралельных правадніках з малой плошчай папярочнага кругавога сячэння, што размешчаны на адлегласці 1 м адзін ад аднаго ў вакууме, выклікае сілу ўзаемадзеяння паміж імі, роўную $2\cdot10^{-7}$ Н на 1 м даўжыні (абсалютны А.). У якасці эталона карыстаюцца міжнар. А.: нязменны ток, які выдзяляе з воднага раствору азотнакіслага серабра за 1 с 0,00118 г серабра. Міжнар. А. роўны 0,99985 абсалютнага. 2) Адзінка магнітарухальнай сілы замкнёнага контура і рознасці магн. патэнцыялаў магнітастатычнага поля ў СІ.

**АМПЕ́РА ЗАКО́Н**, закон механічнага (пандэраматорнага) узаемадзеяння двух токаў, якія цякуць у элементарных адрэзках правадніковў, што знаходзяцца на некаторай адлегласці адзін ад аднаго. Адкрыты А.М.*Амперам* (1820). Сіла $d\vec{F}_{12}$, якая дзейнічае на элемент аб'ёму $dV_2$ правадніка з токам $I_2$ з боку элемента аб'ёму $dV_1$ правадніка з токам $I_1$, вызначаецца формулай: $d\vec{F}_{12}=\frac{\mu_0}{4\pi}(\vec{j}_2\times(\vec{j}_1\times\vec{r}_{12}))\frac{dv_1dv_2}{r_{12}^3}$, дзе $\mu_0$ — магн. пастаянная, $\vec{j}_1$ і $\vec{j}_2$ — шчыльнасць эл.

токаў $I_1$ і $I_2$, $\vec{r}_{12}$ — радыус-вектар, што вызначае становішча $dv_2$ адносна $dv_1$, $\vec{j}_2 \times (\vec{j}_1 \times \vec{r}_{12})$ — падвойны вектарны здабытак вектараў $\vec{j}_1$ $\vec{j}_2$ і $\vec{r}_{12}$.

**АМПЕ́РА СІ́ЛА**, сіла, што дзейнічае на элемент правадніка з токам у магн. полі. Вызначаецца формулай: $d\vec{F} = (\vec{j} \times \vec{B})dV$, дзе $\vec{j}$ — шчыльнасць эл. току ў правадніку, $\vec{B}$ — магн. індукцыя ў тым пункце прасторы, дзе знаходзіцца элемент аб'ёму правадніка $dV$, $\vec{j} \times \vec{B}$ — вектарны здабытак вектараў $\vec{j}$ і $\vec{B}$. Названы ў гонар А.М.*Ампера*.



Схемы ўключэння **амперметра** (А) у электрычны ланцуг: *а* — з шунтам; *б* — праз трансфарматар току; 1 — шунт; 2 і 4 — нагрузка; 3 — трансфарматар току.

**АМПЕРВАЛЬТО́ММЕТР**, тэстэр, універсальная прылада для вымярэння эл. напружання, сілы пераменнага і пастаяннага току, эл. актыўнага супраціўлення. Складаецца з *амперметра, вальтметра, омметра*. Бывае аналагавы (са стрэлачным ці светлавым паказальнікам) і лічбавы. Дае магчымасць выяўляць разрыў і кароткае замыканне ў эл. ланцугах, вызначаць рэжым работы асобных вузлоў электра- і радыёапаратуры.

**АМПЕ́Р-ГАДЗІ́НА** (А·гадз), пазасістэмная адзінка электрычнага зараду, роўная зараду, які праходзіць праз папярочнае сячэнне правадніка за 1 гадз пры сіле эл. току 1 А. 1А·гадз = =3600 Кл. У А.-г. звычайна выражаюць зарад акумулятара.

**АМПЕРМЕ́ТР**, прылада для вымярэння сілы току. Уключаецца ў эл. ланцуг паслядоўна, для павелічэння межаў вымярэнняў — з шунтом (пры пастаянным току) або праз трансфарматар (пры пераменным току). Характарызуецца значэннем намінальнага току, класам дакладнасці, колькасцю фазаў (для пераменнага току) і сістэмай прыстасаванняў. Паводле прынцыпу дзеяння бываюць магнітаэл., электрадынамічныя, электрамагн., цеплавыя і інш.

**АМПІ́Р** (ад франц. empire імперыя), стыль у архітэктуры і мастацтве 1-й трэці 19 ст., які завяршыў развіццё *класіцызму*.

Зарадзіўся ў Францыі на пач. 19 ст. Як і класіцызм, арыентаваўся на ўзоры ант. мастацтва Грэцыі і Рыма, аднак пошукі зграбнай простай формы і дэкору паступова змяняліся імкненнем да іх лапідарнасці і манум. выразнасці. Асн. элементамі арх. кампазіцыі былі масіўныя порцікі (найчасцей дарычнага і тасканскага ордэраў), у арх. дэталях і дэкоры пераважала ваенная эмблематыка (ліктарскія звязкі, воінскія даспехі, лаўровыя вянкі, арлы і інш.). У А. адчуваюцца і асобныя стараж.-егіпецкія арх. і пластычныя матывы (вял. нерасчлянёныя плоскасці сцен і пілонаў, масіўныя геам. аб'ёмы, егіпецкі арнамент, стылізаваныя сфінксы, ільвы, гермы, грыфоны). У перыяд імперыі Напалеона I (1804—15) пашырылася буд-ва мемарыяльных манум. збудаванняў: трыумфальных арак (арка на пл. Ф.А.Жакоба, стылізаванай пад абсталяванне багатага стараж.-рым. дома. У розных краінах Еўропы А. набыў выразныя нац. рысы. У Расіі стаў выразнікам ідэі дзярж. незалежнасці, якую народ адстаяў у вайне 1812. Выдатнымі творамі рус. А. з'яўляюцца будынкі Адміралцейства (1806—23, арх. А.Захараў), Горнага ін-та (1806, арх. А.Варанікін), Біржы (1805—10, арх. Тама дэ Тамон) — усе ў Пецярбургу; помнікі Мініну і Пажарскаму (1804—18, скульпт. І.Мартас), шэраг асабнякоў, пабудаваных арх. А.Грыгор'евым у Маскве.

Да арт. Ампір. Гадзіннік. 19 ст. Гомельскі абласны краязнаўчы музей.

У бел. дойлідстве стыль А. развіваўся пад моцным уплывам рус. архітэктуры. Для будынкаў характэрныя масіўныя кубападобныя аб'ёмы з вял. гладкімі плоскасцямі, з якімі кантрастуюць дэкар. элементы ў выглядзе арнаментаваных панэляў, фрызаў, медальёнаў, разетак, выяў людзей і г.д. Аб'ёмна-прасторавая кампазіцыя вылучаецца строгай прасторай формаў, статычнасцю і манументальнасцю, геам. выразнасцю чляненняў. Нярэдка класічныя ордэрныя элементы перапрацоўваліся ў адпаведнасці з новымі маст. поглядамі, напр., у завяршэнні порцікаў выкарыстоўвалі прамавугольныя або ступеньчатыя атыкі, калоны пераважна дарычнага або тасканскага ордэраў пазбаўлялі энтазіса (патаўшчэння ствала калоны), базы, парушалі іх класічныя прапорцыі (*Сноўскі палацава-паркавы ансамбль, Гомельскі Петрапаўлаўскі сабор*, «Дом паляўнічага» ў Гомелі, 1809—19, арх. Дж.Кларк; асабняк у Слоніме, капліца каля в. Мілавіды Баранавіцкага р-на). У кампазіцыі дамінуе порцік або франтон на гал. фасадзе (жылы дом у Гродне на вул. Замкавай, 16), бельведэр (палац *Жамыслаўскай сядзібы*). Важнае маст. значэнне набыло афармленне ўваходных дзвярэй глухой разьбой. Фасады будынкаў афармляліся барэльефнымі выявамі вайсковых атрыбутаў (палац у Нясвіжскім замку). У інтэр'еры палацаў выкарыстоўваліся буйныя фрызы і панэлі з барэльефнымі кампазіцыямі (*Жыліцкі палацава-паркавы ансамбль*), каларыстычнае вырашэнне інтэр'ера грунтавалася на кантрасце інтэнсіўнага па колеры фону сцен і светлай столі, мармуровых дэталяў аддзелкі камінаў, ліштваў. Важную ролю ў маст. вырашэнні інтэр'ера адыгрывалі творы дэкар.-прыкладнога мастацтва (мэбля, гадзіннікі, падсвечнікі і інш.). Прадстаўнікі А. надавалі вял. значэнне малым арх. формам (фантан сядзібы ў г.п. Нароўля, брамы сядзібы ў в. Барбароў Мазырскага і г. Давыд-Гарадок Столінскага, надмагілле А.Снядэцкага ў в. Гароднікі Ашмянскага р-наў, лаўка на Трышынскіх могілках у Брэсце і інш.). Для твораў дэкар.-прыкладнога мастацтва А. характэрна статычная маналітная форма, з якой кантрастуе пластыка-дэкар. аддзелка ў выглядзе арнаментальных уставак. У мэблі апорам канап, крэслаў, сталоў надаваліся формы калон, каніелюраваных слупоў, яны дэкарыраваліся выявамі грыфонаў, лебедзяў, ільвоў і інш. Цікавы ўзор дэкар. мастацтва стылю А. — камін з выявамі

Да арт. Ампір. Трыумфальная арка на плошчы дэ Голя ў Парыжы. Арх. Ж.Ф.Шальгрэн. 1806—37.

дэ Голя ў Парыжы, 1806—37, арх. Ж.Ф.Шальгрэн), памятных калон і інш. У аддзелцы парадных інтэр'ераў палацаў і атэляў (Мальмезон, Фантэбло, Багарнэ ў Парыжы, перабудаваных арх. Ш.Персье і П.Фантэнам) матывы егіп. рэльефаў, этрускіх вазаў, грэч. і рым. дэкору сугучныя ампірнай мэблі

карыятыдаў (пач. 20 ст.) у жылым доме ў Бабруйску на вул. Пушкіна, 211. У сярэдзіне 19 ст. А. пачаў змяняцца рознымі эклектычнымі плынямі.

*Літ.*: Некрасов А.И. Русский ампир. М., 1935; Isermeyer Ch.-A. Empire. München, 1977. *А.М.Кулагін.*

**АМПЛІТРО́Н** [ад лац. amplificо узмацняю + (*элек*)*трон*], магутная электравакуумная прылада магнетроннага тыпу для ўзмацнення ЗВЧ ваганняў; *плацінатрон*, які працуе ў рэжыме ўзмацнення. Выхадная магутнасць да 10 МВт у імпульсе, ккдз да 80%, каэфіцыент узмацнення да 15 дБ. Выкарыстоўваецца ў выхадных каскадах радыёапаратаў (пераважна імпульсных).

**АМПЛІТУ́ДА** (ад лац. amplitudo велічыня), 1) найбольшае (па абс. значэнні) адхіленне ад нуля перыядычна зменнай фіз. велічыні (напр., найб. зрушэнне маятніка ад стану раўнавагі). 2) Рознасць паказанняў на шкале вымяральнай прылады (барометра, тэрмометра і інш.). 3) У матэматыцы — адна з характарыстык перыяд. функцый (сінуса, косінуса і інш.). 4) У пераносным сэнсе — размах, шырыня.

**АМПЛІТУ́ДНАЯ МАДУЛЯ́ЦЫЯ**, павольная змена амплітуды эл.-магн. ваганняў у параўнанні з іх перыядам па вызначаным законе; від *мадуляцыі*. Выкарыстоўваецца для перадачы інфармацыі ў радыё- і аптычным дыяпазонах хваляў (напр., перадача гукавога суправаджэння, тэлевізійных адлюстраванняў). Перадавальная радыёстанцыя, якая працуе ў рэжыме А.м., вылучае спектр частот. У выпадку А.м. сінусаідальным сігналам (гл. рыс.) спектр мае 3 складальныя: нясучую ($\omega$) і 2 бакавыя частаты ( ($\omega + \Omega$ і $\omega - \Omega$ ). Глыбіня А.м. характарызуе ступень змены амплітуды: $m = \frac{A_{макс} - A_{мін}}{A_{макс} + A_{мін}}$; частата мадуляцыі $\Omega$ — скорасць змены амплітуды ваганняў. Для атрымання амплітудна-мадуляванага вагання нясучая частата і сігнал, якім яна мадулюецца, падаюцца на *мадулятар*.

**АМПЛІТУ́ДНЫ АНАЛІЗА́ТАР**, аналізатар імпульсаў, прыстасаванне для вызначэння закону размеркавання амплітуд эл. імпульсаў. У залежнасці ад канструкцыі бываюць адна- і многаканальныя, з электронным камутатарам, з папярэднім пераўтварэннем амплітуд сігналаў і інш. З дапамогай А.а. аналізуецца размеркаванне амплітуд выпадковага імпульснага працэсу па колькасці імпульсаў, што выявіліся ў зададзеным інтэрвале амплітуд. У аснову А.а. пакладзены схемы *амплітудных дыскрымінатараў* імпульсаў. Выкарыстоўваецца ў эксперым. фізіцы, радыёлакацыі, радыёсувязі і інш.

**АМПЛІТУ́ДНЫ ДЫСКРЫМІНА́ТАР**, прыстасаванне для вылучэння (селекцыі) эл. сігналаў, амплітуда якіх перавышае вызначанае (парогавае) значэнне. Схема А.д. будуецца на электронных прыладах, якія маюць рэзка нелінейную амплітудную характарыстыку (напр., дыёды). Спускавыя схемы А.д. дазваляюць атрымліваць на выхадзе імпульсы, форма і амплітуда якіх не залежаць ад формы першаснага сігналу. Выкарыстоўваецца ў імпульсных сістэмах тэлекіравання і тэлевымярэння пры вылучэнні карыснага сігналу з шумоў; уваходзіць у склад *амплітуднага аналізатара*.

**АМПЛІФІКА́ЦЫЯ** (ад лац. amplificatio пашырэнне), *стылістычная фігура* ў паэтыцы, шэраг аднатыпных слоў ці словазлучэнняў (эпітэтаў, параўнанняў і інш.) для ўзмацнення выразнасці мовы. Напр., «Я чула пяшчотнае, шчырасці поўнае, // Маё беларускае, роднае, кроўнае, // Такое раптоўнае, такое чароўнае, // Такое ласкавае, цёплае, чыстае, // Як сонца агністае, // Як Нёман, празрыстае, // Як казка, быліна, як песня, жаданае, // Дагэтуль яшчэ ў жыцці неспазнанае, // Гарачае слова ад шчырага сэрца!» (Д.Бічэль-Загнетава «Роднае слова»).

Да арт. **Ампір**. Надмагілле А.Сняд-эцкага ў вёсцы Гароднікі Ашмянскага раёна Гродзенскай вобласці. 19 ст.

**АМПЛУА́** (франц. emploi літар. выкарыстанне), своеасаблівая спецыялізацыя акцёра на выкананні роляў, якія найб. адпавядаюць яго вонкавым сцэн. даным, характару, таленту. А. мужчынскія: герой, комік, прастак, палюбоўнік, рэзанёр, фат; жаночыя: гераіня, камічная старая, гранд-дама, інжэню, субрэтка, травесці і інш. У сучасным т-ры падзелу на А. фармальна не існуе, сцвярджаецца шырокі творчы дыяпазон акцёра. Найб. устойлівае А. — травесці (актрыса на ролі хлопчыкаў, дзяўчынак, падлеткаў) захоўваецца ў т-ры для дзяцей.



Блок-схема аднаканальнага **амплітуднага аналізатара**: 1 — уваход; 2 — дыскрымінатар верхняга ўзроўню; 3 — дыскрымінатар ніжняга ўзроўню; 4 — схема антысупадзенняў; 5 — рэгістратар.

**А́МПУЛА** (лац. ampulla), 1) герметычна запаяная шкляная пасудзіна невял. памераў, у якой захоўваецца ў стэрыльным выглядзе пэўная доза лякарстваў, крыві, хім. рэчыва і інш. 2) У ана-

Да арт. **Ампір**. Салон пораў года атэля Багарнэ ў Парыжы. 1804—06.

томіі — пухірападобнае расшырэнне розных органаў, якія маюць форму трубкі, напр. слёзнага канала, прамой кішкі і інш.

**АМПУТА́ЦЫЯ** (ад лац. amputatio адсячэнне), хірургічная аперацыя поўнага ці частковага выдалення перыферычнай часткі канечнасці з перасячэннем (перапілоўваннем, перакусваннем) касцей або органа (малочнай залозы, прамой кішкі, маткі і інш.). Вядома са стараж. часу, асн. яе законы распрацавалі Гіпакрат, А.Парэ, Ф.А.Піці, Дж.Л.Эсмарх, М.І.Пірагоў. А. класіфікуецца па тэрмінах выканання (першасная, другасная), па форме рассячэння мяккіх тканак (кругавая, авальная, акраўкавая), па спосабе ўкрыцця ампутацыйнай куксы (фасцыяпластычная, міяпластычная, касцёвапластычная). Перасячэнне канечнасці на ўзроўні сустава наз. экзартыкуляцыяй.

**АМРА́ВАТЫ**, Амраваты, горад у Індыі, на ПнУ штата Махараштра. 434 тыс. ж. (1991). Гандл. цэнтр буйнога бавоўнаводчага раёна. Рэшткі самага вял. індыйскага мемарыяльнага збудавання — ступа (2 ст. да н.э.).

**АМРА́ЦКАЯ КУЛЬТУ́РА**, археалагічная культура плямёнаў эпохі энеаліту (2-я пал. 5 — пач. 4-га тыс. да н.э.) у Верхнім і Сярэднім Егіпце. Назва ад паселішча каля мяст. Эль-Амра (Егіпет). Насельніцтва займалася земляробствам, жывёлагадоўляй і паляваннем. Для А.к. характэрны чырвоны глянцаваны посуд, на якім белай фарбаю нанесены «крыжалінейны» арнамент. Прылады працы выраблялiся з крэменю, косці, сустракаюцца медныя рэчы (шпількі, гарпуны, пацеркі). Пахавальны абрад — трупапалажэнне ў скурчаным становішчы, у магілы клалі посуд, упрыгожанні, грабяні, статуэткі са слановай косці.

**А́МРЫ**, археал. культура плямёнаў эпохі неаліту і ранняй бронзы (4—3-е тыс. да н.э.), што жылі на тэр. Сінда і Паўд. Белуджыстана (Пакістан). Назва ад паселішча Амры (Сінд). Насельніцтва жыло ў дамах з сырцовай цэглы. Практыкаваліся расчляняныя пахаванні. Кераміка А. крэмавага ці ружовага колеру, глянцаваная, размаляваная пераважна геам. арнаментам, шахматнымі панэлямі і інш. Прылады выраблялiся са сланцу, радзей — з медзі.

**АМРЫКЯ́Н** Міхрдат Аванесавіч (13.5.1843, Тбілісі — 17.2.1879), армянскі акцёр, тэатр. дзеяч; адзін з заснавальнікаў сцэн. рэалізму ў арм. т-ры. Сцэн. дзейнасць пачаў у 1859. Працаваў у Ерэване, Александропалі, Шушы, Канстанцінопалі. З яго імем звязаны традыцыі сцэн. ўвасаблення вобразаў у п'есах Г.Сундукяна. Адна з лепшых роляў — Франц Моар («Разбойнікі» Ф.Шылера). Выступаў як тэатр. крытык.

**АМРЫ́ТА** (санскр.), у індуісцкай міфалогіі боскі напітак неўміручасці. Паводле аднаго з індуісцкіх міфаў, каб здабыць А., багі і асуры збіваюць сусв. акіян, з якога выходзіць бог лячэння Дханвантары з кубкам А. ў руках.

**АМРЫ́ТСАР**, горад на ПнЗ Індыі, штат Пенджаб, 709 тыс. ж. (1991). Трансп. вузел. Прамысл. і гандл. цэнтр. Тэкст., маш.-буд., хім. прам-сць. Вядомы рамёствамі: вытв-сць тканін, дываноў, вырабы з металу, косці, скуры.

Засн. ў канцы 16 ст. гуру Рам Дасам. Гал. рэліг. і культ. цэнтр сіхаў з ун-там Гуру Нанака. Тут знаходзіцца іх святыня — «Залаты храм», дзе захоўваецца свяшчэнная кніга Адыгрантх. У 1-й пал. 19 ст. А. увахо-дзіў у склад дзяржавы *Ранджыт Сінгха*. У 1849 у выніку 2-й англа-сіхскай вайны захоплены англ. Ост-Індскай кампаніяй. У 1918—22 А. — адзін з цэнтраў нац.-вызв. барацьбы. 13.4.1919 англ. войскі расстралялі ў А. мітынг пратэсту супраць палітыкі калан. ўрада; у выніку т.зв. Амрытсарскай разні забіта і паранена больш за 1 тыс. чал. У 1947 А. значна разбураны ў час індуска-мусульманска-сіхскіх пагромаў.

**АМСТЭРДА́М** (Amsterdam), горад, сталіца *Нідэрландаў*. 713,4 тыс. ж. (разам з прыгарадамі больш за 1 млн.; 1993). Знаходзіцца ў правінцыі Паўн. Галандыя, на нізкім беразе зал. Эйселмер каля вусця р. Амстэл. Тунэлі пад ракой злучаюць часткі горада, з Паўночным м. звязаны праз Нордзе-канал, інш. каналамі — з Рэйнам і астатнімі ўнутр. воднымі шляхамі. Адзін з найбуйнейшых у Еўропе порт (грузаабарот больш за 20 млн. т марскіх і больш за 16 млн. т унутраных перавозак штогод), буйны вузел чыгунак (5 ліній) і аўтадарог, у прыгарадзе міжнар. аэрапорт Схіпхал. Гал. гандл. цэнтр Еўропы, адзін з буйнейшых у свеце аптовых рынкаў па продажы тытуню, кавы, какавы, цытрусавых, рысу, каўчуку, прыпраў, драўніны, нафты, збожжа і вугалю. Буйны цэнтр машынабудавання (судна- і авіябудаванне, электратэхн., электроннае, хім. і інш.), нафтаперапр., хім., дрэваапр., швейнай, харч. прам-сці. Традыцыйная ювелірная вытв-сць (апрацоўка алмазаў), паліграфія. У А. праўленні вядучых камерц. банкаў, фондавая біржа. Метрапалітэн, 2 ун-ты (засн. ў 1877 і 1880). Акадэмія навук і мастацтваў.

Упершыню ўпамінаецца ў 1275 як рыбацкая вёска на беразе р. Амстэл. З 1300 горад. Вызваленне Нідэрландаў з-пад улады Іспаніі спрыяла эканам. ўздыму А., ён стаў цэнтрам марскога гандлю і крэдыту сусв. значэння. У 16 ст. ў А. створана біржа, у 1609 засн. разменны банк, узніклі Ост-Індская (1602) і Вест-Індская (1621) гандл. кампаніі. У 1795—1806 сталіца *Батаўскай рэспублікі*, пасля — Нідэрландскага каралеўства. У 1940—45 акупіраваны ням. фашыстамі. Гіст. ядро горада — раён плаціны цераз р. Амстэл (цяпер плошча Дам з каралеўскім палацам; б. ратуша 1648—65, арх. Я. ван Кампен). Своеасаблівасць планіроўкі старых частак А. — сістэма паўкальцавых і радыяльных каналаў, пракапаных у 1610—62 (каля 50 каналаў, 784 масты). Па набярэжных — жылыя дамы з вузкімі фасадамі, будынкі гільдый, кампаній, дабрачынных устаноў 16—18 ст. Захаваліся гар. вароты і вежы 15—17 ст., цэрквы ў стылях готыкі і класіцызму. У 19—20 ст. пабудаваны Дзярж. музей (1885, арх. П.І.Х.Кёйперс), біржа (1903, арх. Х.П.Берлаге), вял. новыя раёны (арх. Берлаге, М. дэ Клерк, К. ван Эстэрэн, П.Л.Крамер і інш.). З 1930-х г. забудоўваецца сучаснымі, у т.л. вышыннымі, будынкамі (арх. В.М.Дзюдак і інш.). Музеі: гарадскі, Музей Каралеўскага ін-та тропікаў, Дом Рэмбранта. *Ф.С.Фешчанка.*

**Амстэрдам.** Плошча Дам.

**АМСТЭРДА́МСКІ ІНТЭРНАЦЫЯНА́Л ПРАФСАЮ́ЗАЎ**, Міжнародная федэрацыя прафсаюзаў, міжнар. аб'яднанне рэфармісцкіх прафсаюзаў у 1919—45. Створаны на кангрэсе ў Амстэрдаме. Гал. мэты: развіццё міжнар. сац. заканадаўства, барацьба з мілітарызмам і рэакцыяй, падтрымка міжнар. прафс. дзеянняў. Кіраўнікі А. і. п. рэалізоўвалі ў прафс. руху палітыку с.-д. партый, якія належалі да *Інтэрнацыянала 2-га*. А. і. п. аб'ядноўваў пераважна прафцэнтры краін Зах. Еўропы (14 краін, 17 738 тыс. чал. у 1919; 26 краін, 19 425 тыс. чал. у 1937). Распушчаны пасля стварэння *Сусветнай федэрацыі прафсаюзаў*.

**АМСТЭРДА́МСКІ КАНА́Л**, гл. *Нордзе-канал*.

**А́МТМАН-БРЫ́ЕДЫТ** (Amtmanis-Briedītis, сапр. Амтманіс) Альфрэд Фрыцавіч (5.8.1885, сядзіба Званітаю Букас, Латвія — 15.5.1966), латышскі акцёр, рэжысёр, педагог; адзін з буйнейшых майстроў рэаліст. акцёрскага мастацтва Латвіі. Нар. арт. СССР (1953). Праф. (1949). Сцэн. дзейнасць пачаў у 1903. З 1919 у Латв. т-ры драмы імя А.Упіта, з 1944 маст. кіраўнік, з 1949 гал. рэжысёр. Сярод роляў: Улдыс («Ветрык, вей!» Я.Райніса), Атвасар («Гліна і фарфор» А.Грыгуліса, Дзярж. прэмія СССР 1948). Яго пастаноўкі вызначаліся яркасцю карцін нар. побыту, эмацыянальна насычанымі характарамі: «Сын рыбака» В.Лаціса (1949, Дзярж. прэмія СССР 1950), «Зямля зялёная» Упіта (1950, Дзярж. прэмія СССР 1951) і інш.

**АМУДАР'І́НСКАЯ ГАЗАНАФТАНО́СНАЯ ПРАВІ́НЦЫЯ**, размешчана на Туранскай нізіне, у пустынных раёнах Каракумаў і Кызылкумаў, у цэнтр. і ўсх. ч. Туркменіі, на З Узбекістана, Пн Афганістана і Ірана. Займае паўд.-ўсх. ч. Туранскай пліты і Перадкапетдагскі краявы прагін. Пл. 417 тыс. км². Першае газавае радовішча адкрыта ў 1953. Выяўлена больш як 90 газавых, газакандэнсатных, газанафтавых радовішчаў на пач. 1980-х г. Прадукцыйныя адклады юры і мелу на глыб. 0,2—4 км. Газы сухія, метанавыя, нафты маласярністыя, шчыльн. 770—900 кг/м³. Газаправоды Бухара—Урал, Сярэдняя Азія—Цэнтр Рас. Федэрацыі і інш.

**АМУДАР'І́НСКІ СКАРБ**. Знойдзены ў 1877 на гарадзішчы Тахці-Кувад у вярхоўях р. Амудар'я на Пд Таджыкістана. Датуецца 5—4 ст. да н.э. Захавалася 178 залатых і сярэбраных прадметаў: аб'ёмныя фігуркі, посуд, рэльефныя рэчы, пласцінкі з адціснутымі выявамі, пярсцёнкі і пячаткі, бранзалеты, дробныя ўпрыгожанні, манета Ахеменідаў. Большасць рэчаў зроблена майстрамі Ахеменідскай дзяржавы і Бактрыі. Асобныя рэчы адлюстроўваюць традыцыі мідыйскага мастацтва, звярынага стылю стэпавых плямёнаў Еўразіі. Захоўваецца ў Брытанскім музеі і Музеі Вікторыі і Альберта ў Лондане.

**АМУДАР'Я́**, рака ў Сярэдняй Азіі, у Таджыкістане, Туркменіі, Узбекістане. Па А. праходзіць частка граніцы Узбекістана з Афганістанам. Даўж. 1415 км, пл. бас. 309 тыс. км² (да г. Керкі). Вытокі на схілах Гіндукуша ў Афганістане, дзе А. называецца Вахандар'я, пасля зліцця з р. Памір — Пяндж, ніжэй упадзення р. Вахш — Амудар'я. Упадае ў Аральскае м. Большая ч. басейна А. размешчана ў горных сістэмах Паміра (на сярэдніх вышынях 5—5,5 тыс. м). Пасля выхаду на раўніну цячэ па Туранскай нізіне, па пустынях Кызылкум і Каракумы. Рэчышча няўстойлівае, рака блукае ў межах поймы, размывае берагі. У нізоўях утварае дэльту, у мора ўпадае некалькімі рукавамі. Асн. прытокі: Гунт, Бартанг, Язгулем, Ванч, Кызылсу, Кафірніган, Сурхандар'я (справа), Кундуз (злева). Жыўленне ледавікова-снегавое. Паводка вясной і летам. Ледастаў у нізоўях (у раёне Нукуса) да 4 мес. Сярэднегадавы расход вады паблізу г. Керкі каля 2000 м³/с. У малаводны перыяд А. не дасягае Аральскага м. Вада вельмі мутная (5—10 кг/м³ завіслых наносаў). У сярэднім цячэнні Кызылкумскі запаведнік. Выкарыстоўваецца для арашэння (каналы Каракумскі, Аму-Бухарскі і інш.). На А. Цюямуюнскі і Тахіяташскі гідравузлы. У нізоўях рыбалоўства. Суднаходная ад г. Чарджоў. На А. — г. Керкі і Чарджоў.

**АМУЛЕ́Т** (лац. amuletum), прадмет, які носіцца на целе і, на думку ўладальніка, мае магічную ўласцівасць адводзіць хваробу, бяду, засцерагаць ад ліхіх чараў. Вера ў сілу А. звязана з першабытнай *магіяй* і *фетышызмам*. У многіх народаў

Залатая бляха з Амудар'інскага скарбу.

Амулет-конік. 12 ст.

Цэнтральная частка Амстэрдама.

свету вера ў А. захавалася да нашых дзён. Гл. таксама *Талісман*.

**А́МУНДСЕН** (Amundsen) Руаль (16.7.1872, г. Борг, Нарвегія — 1928), нарвежскі палярны падарожнік і даследчык. У 1903—06 упершыню праплыў Паўн.-Зах. праходам з У на З ад Грэнландыі да Аляскі. На судне «Фрам» адправіўся ў Антарктыку, 14.12.1911 на сабаках дасягнуў Паўд. полюса. Спрабаваў дасягнуць Паўн. полюса дрэйфам на судне «Мод» (1918—21) і самалётам (1925). У 1926 узначаліў 1-ы трансарктычны пералёт праз Паўн. полюс на дырыжаблі «Нарвегія». Загінуў у Баранцавым м., шукаючы экспедыцыю У.Нобіле. Імем А. названы заліў і катлавіна ў Арктыцы, гара, ледавік, мора, заліў і навук. станцыя ЗША у Антарктыдзе.

Р.Амундсен.

*Тв.*: Рус. пер. — Собр. соч. Т. 1—5. Л., 1936—39; Перелёт через Ледовитый океан. М.; Л., 1927 (разам з Л.Эльсвартам); На корабле «Мод»: Экспедиция вдоль северного побережья Азии. М.; Л., 1929; Южный полюс. М.; Л., 1937.

*Літ.*: Дьяконов М. Амундсен. М., 1937; Яковлев А. Руал Амундсен, 1872—1928. М., 1957.

**А́МУНДСЕНА ЗАЛІ́Ў**, заліў Паўн. Ледавітага ак., паміж берагамі Канады і а-вамі Банкс і Вікторыя. Даўж. каля 445 км, найб. шыр. 213 км. Глыб. да 285 м. Выш. прыліваў 0,2—0,3 м. Большую ч. года ўкрыты лёдам. У прыбярэжнай палясе — здабыча нафты і газу. Названы ў гонар Р.*Амундсена*.

**А́МУНДСЕНА КАТЛАВІ́НА**, падводная катлавіна ў Паўн. Ледавітым ак., паміж хрыбтамі Ламаносава і Гакеля. Даўж. каля 2 тыс. км; шыр. 200—400 км. Глыб. да 4485 м. Дно выраўнаванае, укрытае гліністымі глеямі. У межах А.к. — *Паўночны полюс*. Названа ў гонар Р.*Амундсена*.

Рака Амур.

**А́МУНДСЕНА МО́РА**, ускраіннае мора Ціхага ак., каля зах. берагоў Антарктыды, паміж 100° і 123° зах. д. Пл. 98 тыс. км². Найб. глыб. 585 м. Сярэднегадавая т-ра вады ніжэй 0 °С. Круглы год укрыта лёдам. Водзяцца марскія леапарды, кіты, пінгвіны, цюлень Роса, цюлень Уэдэла; з птушак — буравеснікі, альбатросы і інш. Названа ў гонар Р.*Амундсена*.

**АМУНІ́ЦЫЯ** (польск. amunicja ад лац. munitio прымацаванне, рыштунак), устарэлая назва прадметаў (рамяні, сумкі, чахлы і інш.), якія аблягчаюць вайскоўцам нашэнне зброі, боепрыпасаў, асабістых рэчаў і харчавання. Ва ўзбр. Сілах Рэспублікі Беларусь наз. *рыштунак ваенны*. Конская А. — рэчы для запрагання, сядлоўкі і наўючання жывёлы.

**АМУ́Р**, Купідон, у старажытнарымскай міфалогіі бог кахання, сын *Венеры*. У грэч. міфалогіі адпавядае *Эроту*.

**АМУ́Р**, малая планета № 1221. Адлегласць ад Сонца ў перыгеліі 1,06, у афеліі 2,78 а.а. Найменшая адлегласць ад Зямлі 15 млн. км. Адкрыта Э.Дэльпортам (Бельгія, 1932).

**АМУ́Р** (манг. Хара-Мурэн, кіт. Хэйлунцзян), рака ва Усх. Азіі, у Расійскай Федэрацыі (большая ч.), Манголіі, КНР. Па А. праходзіць частка граніцы Расіі з Кітаем. Утвараецца ад зліцця рэк Шылка і Аргунь. Упадае ў Амурскі ліман Ахоцкага м. Даўж. 2824 км, ад вытоку Аргуні — 4440 км; пл. бас. 1855 тыс. км². У верхнім цячэнні (да вусця Зеі) цячэ ў вузкай даліне. Справа да ракі падыходзяць адгор'і В.Хінгана. У сярэднім цячэнні (ад вусця Зеі да Хабараўска) даліна шырокая, толькі ў месцы перасячэння хр. М.Хінган ператвараецца ў цясніну. У нізоўях А. выходзіць на Ніжнеамурскую нізіну, мае шырокую даліну, рэчышча разгаліноўваецца на рукавы. Асн. прытокі: Зея, Бурэя, Амгунь (злева), Сунгары, Усуры (справа). Жыўленне пераважна (⅔ сцёку) ад летне-восеньскіх мусонных дажджоў. Разводдзе з ліп. да верасня, утвараецца дажджавымі паводкамі. У суткі па А. праходзіць 41 тыс. т наносаў. Замярзае ў ліст., крыгалом у крас.—маі. Сярэднегадавы расход вады ў вусці 10 900 м³/с (макс. 40 000 м³/с). На ніжняе цячэнне ўплываюць прылівы і адлівы. У бас. А. больш за 60 тыс. азёраў агульнай пл. каля 9,7 тыс. км². Рыбалоўства. Асн. прамысл. рыбы: кета, гарбуша, таўсталобік, калуга, амурскі сом і інш. Значныя гідраэнергетычныя рэсурсы. У сярэднім цячэнні Хінганскі, ніжэй — Камсамольскі запаведнікі. А. — гал. водная магістраль Д. Усходу, суднаходны на ўсім працягу. Гал. гарады на А.: Благавешчанск, Хабараўск, Амурск, Камсамольск-на-Амуры, Нікалаеўск-на-Амуры (Расія), Айхой (Кітай).

**АМУ́РА-ЯКУ́ЦКАЯ МАГІСТРА́ЛЬ**, аўтадарога В. Невер—Тамот—Якуцк у Расійскай Федэрацыі. Працягласць 1162 км. Пабудавана ў 1930—37. Звязвае Рэспубліку Саха (Якуція) з Транссібірскай чыг. магістраллю.

**АМУРСА́НА** (1722—57), адзін з уладарных князёў *Айрацкага ханства*, дзеяч антыманьчжурскага вызв. руху ў Манголіі ў 1750-я г. Пасля няўдалай спробы захапіць ханскі прастол у 1754 уцёк у Пекін. Маньчжурскія войскі пад выглядам дапамогі А. ў 1755 акупіравалі і ліквідавалі ханства. Падмануты А. ў 1755 далучыўся да стыхійнага антыманьчжурскага руху і стаў яго правадыром. Пацярпеўшы паражэнне, у 1757 уцёк у Расію.

**АМУ́РСКАЯ ВО́БЛАСЦЬ**, на Пд Д. Усходу Расійскай Федэрацыі. Утворана 20.10.1932. Пл. 363,7 тыс. км². Нас. 1049,1 тыс. чал. (1994), гарадскога 65%. Цэнтр — г. *Благавешчанск*. Буйныя гарады: Белагорск, Райчыхінск, Зея, Шыманоўск, Свабодны, Тында.

**Прырода**. Большая ч. тэр. гарыстая. На Пн Станавы хр. (выш. да 2312 м), на Пд ад яго горны ланцуг хрыбтоў Янкан, Тукурынгра, Сактахан, Джагды; каля ⅔ тэр. займаюць Зейска-Бурэінская і Амурска-Зейская раўніны. Карысныя выкапні: буры і каменны вугаль, золата, жал. руды, кварцавыя пяскі, кааліны, буд. матэрыялы. Ёсць мінер. крыніцы. Клімат мусонны ўмеранага пояса. Зіма халодная, сухая, маласнежная. Лета гарачае і дажджлівае. Сярэдняя т-ра студз. ад -24 °С да -33 °С, ліп. 18—21°С. Ападкаў каля 850 мм за год. Гал. рака — Амур і яго прытокі Зея з Селемджой, Бурэя і інш. Глебы пераважна бурыя лясныя, на Пд — чарназёмападобныя. 65% тэр. пад лесам. Пашыраны хвойныя і мяшаныя лясы маньчжурскага тыпу (мангольскі дуб, карэйскі кедр, амурскі аксаміт, ліяны — вінаград, лімоннік, актынідыя), у тайзе лістоўніца, у гарах зараснікі кедравага сланіку і горная тундра. Водзяцца вавёрка, мядзведзь, сабаль, кабарга, лось, дзік, ізюбр, казуля, з птушак — глушэц, дзікуша, блакітная сарока і інш.

**Гаспадарка**. Асн. галіны прам-сці: горназдабыўная (золата, буры і каменны вугаль), машынабудаванне (вытв-сць кавальска-прэсавага, элеватарнага, свяглотэхн. абсталявання, электрапрылад, рачных і марскіх суднаў, с.-г. машын і інш.); вытв-сць буд. матэрыялаў; харч. прам-сць. Зейская ГЭС. Райчыхінская ДРЭС. А.в. — асноўны с.-г. раён Д. Усходу. Сельская гаспадарка збожжажывёлагадоўчага кірунку. Пасевы збожжавых (пшаніца, авёс, ячмень), соі. Вырошчваюць бульбу, агародніну. Мясамалочная жывёлагадоўля. Пчалярства. На Пн — аленегадоўля, зверагадоўля. Пушны промысел. Па тэр. А.в. праходзяць Транссібірская і Байкала-Амурская чыг. магістралі. Суднаходства па Амуры, Зеі і Бурэі. *Р.А.Жмойдзяк.*

**АМУ́РСКІ ЗАЛІ́Ў**, унутраны заліў каля паўн.-зах. берага заліва Пятра Вялікага Японскага м. Даўж. каля 65 км, шыр. 9—20 км, глыб. да 20 м. Зімой замярзае. На беразе А. з. порт Уладзівасток.

**АМУ́РСКІ ЛІМА́Н**, паўн. частка *Татарскага праліва*, паміж мацерыковай Азіяй і в-вам Сахалін. Злучае Сахалінскі заліў Ахоцкага м. на Пн з уласна Татарскім пралівам на Пд цераз Невяльскога праліў. Даўж. каля 185 км, шыр. да 40 км, глыб. 3—4,5 м. З ліст. да мая ўкрыты лёдам. Прылівы няправільныя, сутачныя, больш за 2 м. У зах. частцы ў ліман упадае р. *Амур*.

**АМУ́РЫ**, рыбы атрада карпападобных. 2 віды: А. белы (Ctenopharyngodon idella) і А. чорны (кітайская плотка; Mylopharyngodon piceus). Радзіма — Усх. Азія ад р. Амур да Паўд. Кітая. На Беларусь А. белы завезены ў 1963, чорны — у 1977. Ва ўмовах Беларусі не нерастуюць; вытворнікі і лічынкі завозяцца. А. белы штучна разводзіцца ў Белаазерскай садковай рыбнай гаспадарцы і гадуецца ў сажалках і некаторых азёрах.

Амуры: белы (уверсе); чорны.

Даўж. цела да 120 см, маса да 32 кг. Луска буйная. Палавая спеласць у 7—9 гадоў пры даўж. каля 70 см. Нераст у чэрв. — ліпені. Кормяцца пераважна воднай расліннасцю, малюскамі, хутка растуць. Перспектыўныя для зарыблення каналаў меліярац. сістэм, водапрыёмнікаў, вадаёмаў, якія хутка зарастаюць.

**АМФАДАНТО́З**, тое, што *парадантоз*.

**А́МФАРА** (лац. amphora ад грэч. amphoreus), у антычных грэкаў і рымлян гліняная або металічная пасудзіна з высокім горлам і 2 вертыкальнымі ручкамі. У А. трымалі і перавозілі віно, алей, мёд, збожжа. На многіх А. ёсць малюнкі, арнаменты, надпісы. Знойдзены на многіх археал. помніках на тэр. Беларусі. На Русі 10—12 ст. выраблялiся амфарападобныя пасудзіны *карчагі*.

**АМФАТЭ́РНАСЦЬ** (ад грэч. amphoteros і той і гэты), здольнасць некаторых хім. злучэнняў праяўляць у залежнасці ад умоў кіслотныя або асн. ўласцівасці. Уласцівая вадзе, аксідам і гідраксідам алюмінію, цынку, хрому і інш., некаторым амінам, амінакіслотам, іанітам.

Пры дысацыяцыі ў водных растворах амфатэрныя злучэнні (амфаліты) утвараюць $H^+$ і $OH^-$ іоны (напр., $Cr^{3+} + 3OH^- \rightleftarrows Cr(OH)_3 \rightleftarrows H^+ + CrO^-_2 + H_2O$). Перавага тыпу ўласцівасцяў амфатэрных гідраксідаў залежыць ад месца элемента ў перыяд. сістэме. А. злучэнняў карыстаюцца ў хім. аналізе для раздзялення элементаў.

Старажытнагрэчаская чорнафігурная **амфара**. 6 ст. да н.э.

**АМФІ...** (ад грэч. amphi каля, вакол, з двух бакоў), прыстаўка, якая абазначае: «з двух бакоў», «вакол», «двоякі», напр., *амфіміксіс, амфікарпія*.

**АМФІБАЛІ́Т**, масіўная або сланцаватая метамарфічная горная парода. Складаецца пераважна з амфіболу (рагавой падманкі), *плагіяклазу* і мінералаў-прымесяў. Колер ад цёмна-зялёнага да чорнага. Шчыльн. 2700—3200 кг/м³. Можа ўтварацца за кошт асн. вывергнутых парод (габра, дыябазаў, базальтаў, туфаў і інш.), ультраасноўных парод, асадкаў мергелістага саставу. Трапляецца ў раёнах развіцця метамарфічных парод, найчасцей дакембрыйскага ўзросту. Выкарыстоўваецца як буд. камень (сыравіна на друз); чорныя разнавід-

насці — выразныя і абліцовачныя камяні.

**АМФІБАЛІ́Я** (ад грэч. amphibolia двухсэнсавасць) у літаратуры, двухсэнсавасць выразу, якая ўзнікае ў выніку сінтаксічнай няўзгодненасці асобных частак выказвання. Напр., у радку верша В.Макарэвіча «Гораду», «Былы я лесаруб, каваль» 2 словы «былы я» ўспрымаюцца як адно «былыя».

**АМФІБІЁНТЫ** [ад *амфі...* + *біёнт*(ы)], арганізмы, якія жывуць або развіваюцца ў двух асяроддзях. Да А. адносяцца віды жывёл і раслін, здольныя жыць і ў вадзе, і на сушы (многія земнаводныя, марскія чарапахі і інш.; гл. *Амфіфіты, Гіграфіты*); віды, якія жывуць у адных узроставых фазах развіцця (звычайна — лічынкавай) у вадзе або ў глебе, у другіх — на сушы. Напр., большасць



Да арт. «Амфібія». Аўтамабіль-«амфібія».

Да арт. «Амфібія». Паплаўковы гідрасамалёт.

жаб, стракоз, камароў, многія мошкі, майскі і чэрвеньскі хрушчы, жукі-шчаўкуны (драцянікі) і інш. Найб. пашыраны ў паласе прыліваў і адліваў.

**АМФІ́БІІ**, гл. *Земнаводныя*.

**«АМФІ́БІЯ»**, 1) аўтамабіль (звычайна павышанай праходнасці) з воданепранікальным кузавам, аснашчаны рухачом (грабным вінтом, вадамётным прыстасаваннем) для руху па вадзе, вадзяным рулём і помпай для адпампоўвання вады з кузава. Для пераадолення стромкіх пад'ёмаў пры выхадзе на бераг «А.» абсталёўваюць лябёдкай. Прызначаны для перапраўкі людзей і грузаў цераз рэкі, азёры і інш. 2) Самалёт «А.» — *гідрасамалёт*, прыстасаваны таксама для ўзлёту з сушы і пасадкі на сушу з дапамогай колавых шасі. Абслугоўваюць пасаж. авіялініі ў раёнах узбярэжжа, рыбныя і зверабойныя промыслы і інш. 3) Аэрасані-«А.» — *аэрасані*, у якіх кузаў на лыжах заменены для лепшай праходнасці адной лодкай-лыжай, што дазваляе рухацца па рыхлым снезе і па вадзе, мелкаводных рэках, забалочаных вадаёмах, лёдзе з праталінамі. Выкарыстоўваюцца для сувязі, у палярных экспедыцыях і г.д. 4) Баявая або транспартная машына (танк, БТР і інш.), здольная перамяшчацца па сушы і вадзе. Плывучасць «А.» забяспечваецца неабходным водазмяшчэннем яе герметызаванага корпуса, на вадзе — вадаходным рухачом (грабныя і паветр. вінты, гусенічныя ланцугі і вадамёты). Распрацоўка «А.» пачалася ў час 1-й сусв. вайны, першыя ўзоры танкаў-«А.» зроблены ў Францыі і ЗША у пач. 1920-х г. На ўзбраенне Чырв. Арміі танкі-«А.» паступілі ў пач. 1930-х г. У 2-ю сусв. вайну «А.» шырока выка-



Амфізбена белая.

рыстоўваліся ўзбр. сіламі ЗША, СССР і інш. краін.

**АМФІБО́ЛЫ** (ад грэч. amphibolos двухсэнсавы, падманлівы), група пародаўтваральных мінералаў падкласа ланцужковых (стужачных) сілікатаў з агульнай формулай (A, B)$_{7-8}$ [$Z_4O_{11}$]$_2$ (OH, F)$_2$, дзе A — K, Na, Ca; B — Al, $Fe^{+3}$, $Fe^{2+}$, Mg і інш.; Z — Si, Al. Асн. структуры — т.зв. «амфіболавая стужка» [$Si_4O_{11}$]. Адрозніваюць манаклінныя і больш рэдкія рамбічныя А. Утвараюць прызматычныя крышталі, ігольчастыя ці тонкавалакністыя агрэгаты. Колер чорны, зялёны, радзей белы ці сіні, да цёмна-фіялетавага. Цв. 5—6,5. Шчыльн. 2,8—3,6 г/см$^3$. Пашыраны ў складзе магматычных і метамарфічных парод (гранадыярытаў, дыярытаў, сіенітаў, андэзітаў, базальтаў і інш.). У зямной кары да 10% (па масе). У прам-сці выкарыстоўваюць хімічна- і тэрмаўстойлівыя тонкавалакністыя амфібол-азбесты. Некаторыя А. — ювелірнавырабныя камяні (*нефрыт*, кракідаліт і інш.); жалезістыя А., якія маюць у сабе волава — патэнцыяльная алавяная руда.

**АМФІБРА́ХІЙ** (грэч. amphibrachys літар. кароткі з абодвух бакоў), 1) у антычным вершаскладанні стапа з 3 складоў — 1 доўгага і 2 кароткіх (⏑ - ⏑). Наз. таксама брахіхарэй — стапа, якая складаецца з кароткага складу і харэя. 2) У сілабатанічным вершаскладанні А. — 3-складовая стапа з рытмічным націскам на сярэднім складзе (- ˊ -): «З леге́ндаў і ка́зак былы́х пакале́нняў, // З кало́сся цяжко́га жыто́ў і пшаніц...» (М.Танк. «Родная мова»). У бел. паэзіі А. з'явіўся ў канцы 19 ст. У зб. Ф.Багушэвіча «Смык беларускі» (1894) з 9 вершаў (акрамя цыкла «Песні») 32 радкі вытрыманы ў памерах 3-складовага А.

Шырока выкарыстоўваецца ў сучаснай паэзіі.

**АМФІЗБЕ́НЫ** (Amphisbaenia), падатрад паўзуноў атр. лускаватых. Некалькі сямействаў. Каля 140 відаў. Пашыраны пераважна ў Паўд. і Цэнтр. Амерыцы, Афрыцы, Зах. Азіі, 1 від у Паўд. Еўропе, 1 — на ПдУ ЗША. Найб. вядомыя белая А. (Amphisbaena alba), плямістая двухходка (A. fuliginosa), хірот (Bipes canalicubatus).

Даўж. да 70 см. Цела цыліндрычнае, чэрвепадобнае, з кароткім хвастом, укрытае суцэльнай рагавой плеўкай з вузкімі папярочнымі кольцамі. У большасці канечнасці адсутнічаюць. Вядуць падземны спосаб жыцця, часта пасяляюцца ў мурашніках і тэрмітніках. Па хадах у зямлі могуць рухацца хвастом уперад (адсюль назва). Кормяцца мурашкамі, тэрмітамі, іх лічынкамі.

**АМФІКАРПІ́Я** (ад *амфі...* + грэч. karpos плод), утварэнне на расліне пладоў двух тыпаў: надземных і падземных. Падземныя ўтвараюцца з завязі, якая закопваецца пасля апладнення ў глебу (геакарпія). А. назіраецца ў кісліцы і некаторых інш. раслін.

**АМФІКТЫЯНІ́Я** (грэч. Amphiktionia), рэлігійна-паліт. саюз плямёнаў і гарадоў у Стараж. Грэцыі, які меў агульныя свяцілішчы, казну, правілы вядзення вайны і інш. Ёсць звесткі пра А. пры свяцілішчах Апалона: у Дэльфах, на в-ве Дэлас; пры свяцілішчах Пасейдона: на в-ве Калаўрыя, у Беотыі і інш. Найб. звестак захавалася пра дэльфійска-пілейскую А., куды ўваходзіла 12 абшчын. А. страцілі значэнне пасля заваявання Грэцыі рымлянамі (146 да н.э.).

**АМФІЛІ́НА** (Amphilina), род плоскіх чарвей з кл. цэстодаў. Невял. архаічная група паразітаў поласці цела асятровых рыб і чарапах. Пашыраны A. foliacea і A. neritina у рыб у рэках Каспійскага бас. і Сібіры.

Цела нерасчлянёнае, даўж. 25—65, шыр. 17—30 мм. Гермафрадыты. Не маюць кішэчніка і не прымацоўваюцца. Яйцажывародныя. Цыкл развіцця адбываецца са зменай гаспадароў. Лічынка (лікафора) развіваецца ў яйцы, мае 10 зародкавых кручкоў на заднім канцы цела. Пранікае ў прамежкавых гаспадароў — ракападобных, дзе зменьваецца і становіцца падобнай на палаваспелую асо-

біну. З страўніка канчатковага гаспадара лічынка мігрыруе ў поласць цела канчатковага гаспадара і дасягае палавой спеласці.

**АМФІМА́КР** (грэч. amphimakros літар. з двух бакоў доўгі), у *антычным вершаскладанні* стапа з 3 складоў (2 доўгіх і 1 кароткага).

**АМФІМІ́КСІС** (ад *амфі...* + грэч. mixis змяшэнне), звычайны тып палавога працэсу ў жывёл і раслін, пры якім адбываецца зліццё ядраў мужчынскай і жаночай палавых клетак (гамет). Процілегласць *апаміксісу*. У вузкім сэнсе — зліццё дзвюх няродных гамет ад розных асобін (у адрозненне ад аўтаміксісу). У кветкавых раслін А. адбываецца ў форме двайнога апладнення. Тэрмін «А.» увёў ням. біёлаг А.Вейсман (1892) для абазначэння аб'яднання спадчынных субстанцый дзвюх асобін пры апладненні.

**АМФІПРАСТЫ́ЛЬ** (грэч. amphiprostylos), тып стараж.-грэч. прамавугольнага ў плане храма, які мае калонныя *порцікі* на тарцовых фасадах, пазбаўленыя дэкору падоўжныя сцены. А. звычайна будавалі з гладкіх каменных блокаў. Шырока вядомы А., пабудаваны паводле праекта Калікрата на Афінскім *Акропалі*, храм Ніке Аптэрас (Бяскрылай Перамогі).

**АМФІТЭА́ТР** (грэч. amphitheatron), 1) у Стараж. Рыме манументальнае збудаванне для публічных відовішчаў: баёў гладыятараў, цкавання дзікіх звяроў, масавых тэатралізаваных паказаў. Меў эліпсападобную ў плане форму, з арэнай пасярэдзіне, вакол якой ступенькамі ўзвышаліся месцы для гледачоў. Яго канструкцыйную аснову складала сістэма арак і слупоў, паміж якімі знаходзіліся галерэі і лесвіцы, напр., *Рымскі Калізей*. 2) Сучасныя А. выкарыстоўваюцца ў кінатэатрах, тэатр., цыркавых, спарт. будынках, маюць эліпсападобны, паўцыркульны сегментавы план. На аснове А. пабудаваны глядзельныя залы Дзярж. тэатра оперы і балета Беларусі, кінатэатра «Кастрычнік» у Мінску, месцы для гледачоў у цырках Гомеля, Мінска, на мінскім стадыёне «Дынама» і інш.

**АМФІТЭА́ТРАЎ** Аляксандр Валянцінавіч (26.12.1862, Калуга — 26.2.1938), рускі пісьменнік. Скончыў Маскоўскі ун-т (1885). Аўтар зб-каў апавяданняў «Псіхапаты. Праўда і выдумка» (1893), «Мроі і цені» (1896), раманаў «Атручанае сумленне» (1890; аналіз псіхал. матываў злачынства), «Жар-кветка» (1895; тэма спірытызму і акультызму), «Вікторыя Паўлаўна» (1903; пытанне жаночай эмансіпацыі), «Мар'я Лусьева» (1903; праблема прастытуцыі), гіст. твора «Звер з прорвы» (1911—14), фельетонаў, літ.-крыт. артыкулаў. Раманы-хронікі са шматтомнай серыі «Канцы і пачаткі. Хроніка 1880—1910» — спроба асэнсаваць жыццё рас. грамадства на рубяжы стагоддзяў. З 1921 у эміграцыі. Выдаў раман «Зачараваны стэп» (1921), кн. нарысаў «Тужлівыя нататкі» (1922), зб. «Неўтаймаваная Русь: Дэманічныя аповесці XVII ст.» (1929) і інш. На бел. мову творы А. перакладаў В.Ластоўскі.

*Тв.*: Собр. соч. Т. 1—30, 33—35, 37. Спб., 1911—16; Закат старого века. М., 1989; Мертвые боги. М., 1991; Бел. пер. — Хілібертава пакута; Вярба; Палятуха. Вільня, 1912.

**АМФІУ́МЫ** (Amphiumidae), сямейства хвастатых земнаводных. 3 віды. Найб. вядомая А. меанс. Пашыраны на ПдУ ЗША. Жывуць у забалочаных вадаёмах, азёрах, непраточных глеістых вадаёмах, на рысавых чэках (абвалаваных участках палёў).

Даўж. 0,8—1 м. Цела чорнае, вугрападобнае. Маюць 2 пары малых рудыментарных канечнасцяў з 2—3 недаразвітымі пальцамі, унутр. шчэлепы і схаваныя пад скурай вочы. Лічынкі дыхаюць шчэлепамі, дарослыя — лёгкімі. Зімуюць у глеі. Кормяцца беспазваночнымі, радзей дробнымі рыбамі, земнаводнымі. Адкладваюць на сушы ў вільготных месцах да 150 яец. Палавая спеласць на 4-м годзе. Выкарыстоўваюцца мяса, тлушч і скура.



Амфіліна.

Да арт. **Амфіпрастыль**. Храм Ніке Аптэрас на Акропалі ў Афінах. Арх. Калікрат. 449—420 да н.э.

**АМФІФІ́ТЫ** [ад *амфі...* + ... *фіт*(ы)] водныя, прымацаваныя да грунту вадаёма расліны, большасць лістоў і кветак якіх размешчана пад вадой. Напр., рагоз, трыснёг, стрэлкаліст і інш. Многія А. — тыповыя прыбярэжна-водныя і земнаводныя расліны-«амфібіі», прыстасаваныя да росту і ў вадзе, і на сушы (гл. *Амфібіёнты*).

**АМХА́РА** (саманазва а м а р а), народ у Эфіопіі. 18,16 млн. чал. (1987). Гавораць на *амхарскай мове*. Паводле рэлігіі пераважна хрысціяне-манафісіты.

**АМХА́РСКАЯ МО́ВА**, адна з *семіта-хаміцкіх моў* (семіцкая група). Пашырана ў Эфіопіі (дзярж. мова) і некат. сумежных краінах (Самалі, усх. раёны Судана). Генетычна блізкая да эфіопскай мовы — геэз (мёртвая мова эпіграфікі і

Да арт. **Амфітэатр**. Старажытнарымскі тэатр у Турцыі.

**Амфіума** меанс.

хрысц. л-ры Эфіопіі). У А.м. вылучаюць 3 дыялекты: шаанскі (аснова літ. мовы), гаджамскі і гандарскі. У фанетыцы 7 галосных і 28 зычных фанем. Для імянога словаўтварэння характэрна словаскладанне, для сінтаксісу — фіксаваны парадак слоў з выказнікам у канцы сказа. Першыя пісьмовыя помнікі датуюцца 14 ст. Літ. А.м. развіваецца з 19 ст. і карыстаецца складовым эфіопскім пісьмом.

*Літ.*: Титов Е.Г. Современный амхарский язык. М., 1971.

**АМША́РА**, мохавае (сфагнавае) балота, гл. *Імшара*.

**АМЫЛЕ́ННЕ**, хімічная рэакцыя пераўтварэння вытворных арган. кіслот (эфіраў, нітрылаў, амідаў, хлорангідрыдаў і інш.) у кіслоты ці іх солі *гідролізам*. Адбываецца ў прысутнасці шчолачы ці неарган. кіслаты, пры ўдзеле ферментаў. Напр., гідроліз складанага эфіру з утварэннем кіслаты і спірту: $RCOOR^1 + H_2O \rightarrow RCOOH + R^1OH$. Тэхн. характарыстыка тлушчаў — лік А. (колькасць мг KOH, неабходная для А. 1 г складанага эфіру). Для жывёльных тлушчаў роўны 170—260, алеяў — 170—200, пчалінага воску 88—103. З алеяў і жывёльных тлушчаў А. атрымліваюць гліцэрыну, вышэйшыя тлустыя кіслоты і іх солі — *мыла* (адсюль назва рэакцыі).

Амяла белая.

**АМЯЛА́** (Viscum), род паўпаразітных кветкавых раслін сям. амяловых. Каля 100 відаў. Пашыраны ў трапічнай і субтрапічнай Афрыцы і Азіі, на Пн Аўстраліі; А. белая (V. album) трапляецца ў Еўропе і на Каўказе, А. афарбаваная (V. coloratum) — на Д. Усходзе. На Беларусі А. белая расце ў зах. і паўд. раёнах пераважна на старых лісцевых дрэвах, асобны падвід (ssp. austriacum) на хвоі.

Двухдомны шматгадовазялёны шарападобны куст дыям. да 1,2 м. Лісце прадаўгавата-авальнае, супраціўнае, скурыстае, жоўта-зялёнае, размешчана папарна на канцах галінак. Кветкі дробныя жоўта-зялёныя, сабраны ў пучкі. Плод — белая аднанасенная ягада з клейкай мякаццю. Размнажаецца насеннем, якое птушкі заносяць на галіны дрэў, дзе яно і прарастае. Выкарыстоўваецца на лячэнне гіпертаніі і неўралгіі, як танізоўны сродак (прэпараты амялен, віскулен, акафіт), у нар. медыцыне пры хваробах сэрца і лёгкіх.

**АМЯЛУ́ШКА** (Bombycilla garrulus), птушка атрада вераб'інападобных. Пашырана ў хвойных лясах Паўн. Еўразіі і Амерыкі. На Беларусі трапляецца на веснавым (крас.) і асеннім (ліст.) пралётах, асобныя зрэдку зімуюць. Трымаецца чародкамі да 200 асобін.

Даўж. да 21 см, маса да 73 г. Апярэнне густое, мяккае, ружова-шэрае. На крылах і хвасце невял. жоўтыя, белыя і чырвоныя плямкі. Высокі чуб на галаве. Гняздуецца на дрэвах. Нясе 5 яец. Корміцца ягадамі рабіны, шыпшыны, крушыны, ядлоўцу і пупышкамі раслін.

Амялушка.

**АМЯЛЬНА́Я**, вёска ў Беларусі, у Іванцевіцкім р-не Брэсцкай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 43 км на ПдУ ад Іванцевічаў, 178 км ад Брэста, 45 км ад чыг. ст. Іванцевічы. 523 ж., 171 двор (1994). Сярэдняя школа, Дом культуры, амбулаторыя, аддз. сувязі.

**АМЯЛЬНЯ́НСКІ**, біялагічны заказнік на вярховым балоце Парэцкі Мох у Пухавіцкім р-не Мінскай вобл. Засн. ў 1979 для захавання ў прыродным стане месцаў росту журавін. Пл. 1784 га (1994). У раслінным покрыве пераважаюць хваёва-сфагнавыя і хваёва-кусцікава-сфагнавыя фітацэнозы. На ўскраінах і «астраўках» балота — хваёвыя, хваёва-бярозавыя і асінава-яловыя лясы. Шматлікая касандра (балотны верас); на прылеглых да балота сырых лугавінах вялікая папуляцыя касача сібірскага, занесенага ў Чырвоную кнігу Беларусі.

**АМЯЛЬЯ́НЧЫК** Міхаіл Сцяпанавіч (н. 10.2.1940, в. Заточча Драгічынскага р-на Брэсцкай вобл.), бел. вучоны ў галіне агульнай гігіены. Д-р мед. н. (1993), праф. (1995). Скончыў Гродзенскі мед. ін-т (1969). У 1969—77 і з 1980 у гэтым ін-це (з 1994 заг. кафедры). У 1977—80 у Аддзеле рэгуляцыі абмену рэчываў АН БССР. Навук. працы па гігіене працы ў розных галінах вытв-сці, па пытаннях забруджвання навакольнага асяроддзя, аховы здароўя і захоўвання генафонду бел. нацыі.

*Тв.*: Экспериментальное изучение ингаляционного воздействия этанола на крыс при беременности на некоторые показатели у потомства // Алкоголизм и наследственность: (Материалы Междунар. симпозиума). М., 1987; Peril of ethanol consumption by offsprings of rat intoxicated by low doses of alcohol (разам з А.В.Ліопам, В.У.Чумаковай) // Alcoholism: Clinical and Experimental Research. Seventh Congress of the International Society for Biomedical Research on Alcoholism. Gold Coast, Queensland, Australia, 1994. Vol. 18. № 2.

**АМЯЛЯ́НСКІ** Васіль Леанідавіч (10.3.1867, Палтава — 21.4.1928), мікрабіёлаг. Акад. АН СССР (1923). Скончыў Пецярб. ун-т (1890). Вучань С.М.*Вінаградскага*. З 1893 у Ін-це эксперым. медыцыны ў Пецярбургу. Навук. працы аб ролі мікраарганізмаў у кругавароце рэчываў (азоту і вугляроду), яе комплексным даследаванні марфал. і фізіял. метадамі. У 1904 вылучыў культуру бактэрый, якія выклікаюць метанавае і вадароднае браджэнне цэлюлозы. Першы адзначыў, што мікраарганізмы можна выкарыстоўваць як хім. індыкатары. Аўтар першага ў Расіі падручніка «Асновы мікрабіялогіі» (1909).

**АМЯРЦВЕ́ННЕ**, тое, што *некроз*.

**АН...**, гл. *а...*

**АНА...** (грэч. ana...), прыстаўка, якая абазначае «рух уверх», «узмацненне дзеяння», «адваротнае дзеянне», «зваротнае дзеянне», напр., *анабіёз, анафаза*.

**АН** (шумер. «неба»), Анум, Ану (акад.), у шумера-акадскай міфалогіі бог неба, адно з цэнтральных божастваў. А. стварае сямёрку злосных дэманаў утуку і пасылае іх супраць бога месяца, каб зацямніць яго. Існуе жаночая паралель А. — Антум.

**АНА́БА**, Бон, горад на ПнУ Алжыра, адм. ц. вілаі Анаба. 306 тыс. ж. (1987). Трансп. вузел. Порт на Міжземным м. Міжнар. аэрапорт. Металургічны комплекс Эль-Хаджар. Металаапр., харчасмакавыя, хім. (вытв-сць аміяку, угнаенняў), тэкст. прадпрыемствы. Ун-т. Тэатр. Мячэць Сідзі бу Меру ан (11 ст.).

**АНАБАЗІ́Н**, α-піперыдзіл-β-піперыдзін (CHN), арганічнае рэчыва класа *алкалоідаў*. Бясколерны алей, які цямнее на паветры: $t_{кіп}$ 276 °C; добра раствараецца ў вадзе і арган. растваральніках; дае шчолачную рэакцыю.

Выяўлены сав. хімікам А.П.Арэхавым (1929) у сярэднеазіяцкім анабазісе бязлістым (Anabasis aphylla). У невял. колькасці ёсць у тытуні. Як і яго ізамер нікацін, А. моцны гангліянарны яд. Выкарыстоўваецца супраць шкоднікаў раслін; сродак ад стрыгучага лішая, вашывасці с.-г. жывёл.

**АНАБАЛІ́ЗМ** (ад грэч. anabolē уздым), асіміляцыя, сукупнасць хім. працэсаў у жывым арганізме, якія забяспечваюць біял. сінтэз патрэбных для жыцця складаных рэчываў (бялкоў, поліцукрыдаў, тлушчаў, нуклеінавых кіслот і інш.) з больш простых. Накіраваны на ўтварэнне і абнаўленне структурных частак клетак і тканак. Непарыўна звязаны з *катабалізмам* (процілеглы працэс) і ўтварае з ім хім. аснову прамежкавага абмену рэчываў і абмену энергіі (забяспечвае яе назапашванне) у арганізме. Аўтатрофныя арганізмы (зялёныя расліны і некаторыя грыбы) здольныя ажыццяўляць першасны сінтэз арган. злучэнняў з $CO_2$ з выкарыстаннем вонкавых крыніц энергіі (сонечнага святла, акіслення неарган. рэчываў), гетэратрофныя — толькі за кошт энергіі, якая вызваляецца ў працэсах катабалізму. Колькасць зыходных кампанентаў для біясінтэзу абмежаваная (глюкоза, рыбоза, амінакіслоты, піравінаградная кіслата, гліцэрына, ацэтылкаэнзім А і інш.). Як правіла, А. забяспечваецца спецыфічным наборам ферментаў і ўключае шэраг аднаўленчых этапаў. У працэсе А. кожная клетка сінтэзуе характэрныя для яе бялкі, вугляводы, тлушчы і інш. злучэнні (напр., мышачныя клеткі сінтэзуюць уласны глікаген і не скарыстоўваюць глікаген печані). У высокаарганізаваных арганізмаў у рэгуляцыі А. на ўзроўні клетачнага абмену рэчываў акрамя ферментаў удзельнічаюць гармоны і інш. біял. актыўныя рэчывы, нерв. сістэма (гл. *Нейрагумаральная рэгуляцыя*). Многія прыродныя і сінтэтычныя рэчывы (анаболікі) здольныя павышаць узровень А., іх выкарыстоўваюць для штучнага нарошчвання мышачнай масы цела ў спорце (праблема допінг-кантролю), таксама як лек. сродкі ў тэрапіі хвароб абмену рэчываў.

**АНАБАЛІ́Я**, спосаб змянення *антагенезу* ў працэсе эвалюцыі арганізмаў, калі закончаны формаўтваральны працэс дапаўняецца дыферэнцыроўкамі. Тэрмін увёў рус. біёлаг А.М.Северцаў (1912). А. звязана з тым, што формаўтваральныя працэсы вельмі складаныя і не дапускаюць істотных змен пачатковых ці сярэдніх стадый развіцця. У выпадку, калі асновы структуры жыццёва важнага органа закладзены, магчымы некаторыя яе змены, варыянты, якія не парушаюць жыццяздольнасці арганізма. Прыклад А. — зрастанне храсткоў і касцей у шкілеце дарослых пазваночных, якія ў продкаў заставаліся асобнымі.

**АНАБАПТЫ́СТЫ** (ад грэч. anabaptizō перахрышчваю), перахрышчэнцы, удзельнікі радыкальнага народнасектанцкага руху эпохі Рэфармацыі пераважна ў Германіі, Швейцарыі, Нідэрландах. Патрабавалі паўторнага хрышчэння (у свядомым узросце), адмаўлялі царк. іерархію, асуджалі багацце, заклікалі да ўвядзення агульнай маёмасці. Удзельнічалі ў *Сялянскай вайне 1524—26* у Германіі, утварылі *Мюнстэрскую камуну* (1534—35); разгромлены. А. праніклі і ў некаторыя бел. гарады, дзе знайшлі паслядоўнікаў сярод мясц. рамеснікаў. Асобныя элементы вучэння А. перайшлі ў дагматыку некаторых пратэстанцкіх сектаў (*баптыстаў* і *квакераў*).

**АНАБА́Р**, рака ў Рэспубліцы Саха (Якуція). Даўж. 939 км. Пл. басейна 100 тыс. км². Вытокі на Анабарскім плато, цячэ на Паўн.-Сібірскай нізіне, упадае ў мора Лаптевых. Гал. прытокі:

Анабас.

М.Куанамка, Уджа (справа), Суалама, Харабыл (злева). Ледастаў з канца вер. да мая. Зімой на перакатах прамярзае да дна. У вусці шмат рыбы (нельма, муксун, рапушка, омуль і інш.).

**АНАБА́РСКАЕ ПЛАТО́**, на ПнУ Сярэднесібірскага пласкагор'я, у Краснаярскім краі і Рэспубліцы Саха (Якуція) Рас. Федэрацыі. Выш. да 905 м. Складзена пераважна са сланцаў, гнейсаў і гранітаў. Да выш. 450 м рэдкастойныя лістоўнічныя лясы, вышэй — горная тундра.

**АНАБА́РСКІ ЗАЛІ́Ў**, у заходняй частцы мора Лаптевых, паміж берагам мацерыка Еўразіі і п-вам Нордвік. Даўж. 67 км, шыр. каля ўваходу 76 км, ва ўнутр. частцы 7—9 км, глыб. 3—12 м. На Пд пераходзіць у Анабарскую губу, у якую ўпадае р. Анабар. Большую ч. года ўкрыты лёдам.

**АНАБА́С**, паўзун (Anabas testudineus), рыба атрада акунепадобных. Водзіцца ў стаячых і слаба праточных вадаёмах Паўд. і Паўд.-Усх. Азіі.

Даўж. да 25 см. Цела буравата-зялёнае, бруха жаўтаватае. Можа жыць без вады каля 8 гадзін. З дапамогай хваста, грудных плаўнікоў і шыпоў шчэлепных накрывак поўзае па сушы. Дыхае атм. паветрам з дапамогай спец. надшчэлепнага органа. У сухі сезон упадае ў спячку, закопваючыся ў глей. Драпежнік. Аб'ект мясц. промыслу, разводзяць у [illegible].

**АНАБЕРГІ́Т** (ад назвы радовішча Анаберг у ФРГ), мінерал класа арсенатаў $Ni_3[AsO_4]_2 \cdot 8H_2O$. Поўны ізамарфізм з *эрытрынам*. Часта мае ў сабе кобальт, прымесі кальцыю, магнію, жалеза, цынку. Крышталізуецца ў манакліннай сінганіі. Утварае скарынкі, налёты, зямлістыя агрэгаты. Колер светла-зялёны. Бляск шкляны, да зямлістага. Цв. 2,5—3. Шчыльн. 3,1 г/см³. Утвараецца ў зонах акіслення арсенідаў кобальту і нікелю. А. («нікелевыя кветкі») — пошукавая прыкмета на нікелевыя руды.

**АНАБІЁЗ** (ад *ана...* + *...біёз*), стан арганізма, пры якім жыццёвыя працэсы (абмены рэчываў і інш.) часова спыняюцца або настолькі запавольваюцца, што адсутнічаюць усе бачныя прыкметы жыцця. З'яўляецца эвалюцыйна выпрацаваным фізіял. прыстасаваннем арганізмаў да ўздзеяння адмоўных фактараў асяроддзя (нізкія або высокія т-ры, адсутнасць вільгаці, корму і інш.). Пры спрыяльных умовах нармальныя функцыі жыццёвых працэсаў аднаўляюцца. Назіраецца ў мікраарганізмаў (споратворальныя бактэрыі, мікраскапічныя грыбы), раслін і жывёл. Уваходзіць у нармальны цыкл развіцця многіх арганізмаў (насенне, споры, цысты). Беспазваночныя (гідры, чэрві, некаторыя ракападобныя, насякомыя, малюскі) і пазваночныя (земнаводныя і паўзуны) пры А. здольны страчваць да 3/4 вады з тканак. З'яву А. выкарыстоўваюць пры прыгатаванні сухіх жывых вакцын, кансерваванні донарскай крыві і тканак для трансплантацыі, спермы жывёл і інш.

**АНАГЕНЕ́З**, гл. *Арамарфоз*.

**АНАГРА́МА** (ад *ана...* + грэч. gramma літара), 1) слова ці словазлучэнне, утворанае перастаноўкай літар, напр.: псеўданімы М.Алданаў (М.Ландаў), Акшарум (Р.Мурашка), Ак.Чыж (Х.Жычка). А. выкарыстоўваюць у *шарадах*. 2) Спосаб вершаскладання на санскрыце, лац. і інш. стараж. індаеўрап. мовах, калі асобныя фанемы самага важнага слова ў вершы паўтараюцца ў складзе інш. слоў.

**АНАДЗІ́РАВАННЕ**, утварэнне плёнкі вокісу электрахімічным спосабам (*электролізам*) на паверхні метал. вырабаў. Пры А. вырабы, апушчаныя ў электраліт, злучаюць з анодам крыніцы току. Вокісныя плёнкі (таўшчынёй 1—200 мкм) маюць павышаную цвёрдасць, гарача- і зносаўстойлівасць, электраізаляцыйныя ўласцівасці, моцна злучаюцца з металам, з'яўляюцца добрай асновай для лакафарбавых пакрыццяў. Анадзіруюць пераважна алюміній і яго сплавы. А. выкарыстоўваюць у машынабудаванні (для аховы вырабаў ад карозіі), прыладабудаванні (для аховы прылад ад мех. і хім. уздзеянняў і дэкар.

ўпрыгажэння), самалётабудаванні і радыёэлектроніцы.

**АНАДО́НТЫ**, гл. *Бяззубкі*.

**АНА́ДЫР**, рака на крайнім ПнУ Сібіры, у Чукоцкай аўт. акрузе Расійскай Федэрацыі. Даўж. 1150 км, пл. бас. 191 тыс. км². Пачынаецца на Анадырскім пласкагор'і, упадае ў Чукоцкага п-ва. Даўж. 278 км, шыр. каля ўваходу да 400 км, глыб. да 105 м. У заліў упадае р. Анадыр. Большую частку года ўкрыты лёдам. Прылівы пераважна паўсутачныя (да 3 м). На беразе заліва порт Анадыр.

Анакрэонт.

Анадырскі заліў Берынгава м. У вярхоўях мае горны характар, вузкую даліну. На Анадырскай нізіне рэчышча расчляняецца на сетку рукавоў і пратокаў. Асн. прытокі: Майн (справа), Белая, Танюрэр (злева). Сярэдні расход вады ў ніжнім цячэнні 1680 м³/с. Ледастаў з кастр. да канца мая — пач. чэрвеня. У бас. А. больш за 23,5 тыс. азёраў агульнай пл. 3231 км². У ніжнім цячэнні — рыбалоўства. Суднаходная ад с. Маркава (570 км).

**АНА́ДЫР**, горад у Расіі, цэнтр Чукоцкай аўт. акругі. 14,1 тыс. ж. (1994). Порт на беразе Анадырскага заліва Берынгава м. Харч. прам-сць. У раёне — здабыча золата, вугалю; аленегадоўля, рыбалоўства.

**АНА́ДЫРСКАЕ ПЛАСКАГО́Р'Е**, на ПнУ Азіяцкай часткі Расійскай Федэрацыі, у бас. верхняга цячэння р. Анадыр. Даўж. каля 400 км. Пераважныя выш. 800—1100 м, найб. — да 1221 м. Складзена ў асноўным з базальтаў, андэзітаў, дацытаў. Пераважае хмызняковая і горная тундра. Аленевыя пашы.

**АНА́ДЫРСКАЯ НІЗІ́НА**, на ПнУ Азіяцкай часткі Расійскай Федэрацыі, у Чукоцкай аўт. акрузе, у даліне р. Анадыр. На У прылягае да Анадырскага заліва, на З абмежавана хрыбтамі Пэкульней і Рарыткін. Даўж. 270 км. Складзена з алювіяльна-азёрных адкладаў. Рэльеф пераважна раўнінны (выш. да 100 м), бліжэй да гор хвалісты, на У з астанцавымі і нізкагорнымі масівамі (Залаты хрыбет, Ушканоў краж). Усюды шматгадовая мерзлата. Шмат тэрмакарставых азёраў, азёраў-старыц. Ландшафт травяніста-купінаватай і хмызняковай тундры.

**АНА́ДЫРСКІ ЗАЛІ́Ў**, у паўночна-ўсходняй частцы Берынгава м., каля берагоў

**АНАКАЛУ́Ф** (ад грэч. anakoluthos непаслядоўны, няправільны), *стылістычная фігура* ў паэтыцы, лагічная ці сінтаксічная няўзгодненасць асобных частак выказвання. Напр.: «Празрыстае — можна каменне злічыць, // Блакітнае — неба ў ім палавіна, // Багатае — рыба лускою блішчыць, // Магутнае — слова ад бацькі і сына» (М.Лужанін. «Запрашэнне на возера Нарач»). У маст. творы дапамагае індывідуалізаваць мову персанажа, надаць ёй асаблівы каларыт.

**АНАКАПІ́ЙСКАЯ ПЯЧО́РА**, гл. *Новаафонская пячора*.

**АНАКО́НДА** (Eunectes murinus), змяя роду ўдаваў атр. лускаватых. Трапляецца ў тропіках Паўд. Амерыкі па берагах рэк, азёраў, каля балот.

Анаконда.

Самая вял. змяя — даўж. да 10 м. Скура аліўкава-шэрая, уздоўж спіны 2 рады вял. бурых плямаў. Добра плавае. Ноздры з клапанамі, можа доўга знаходзіцца пад вадой. Корміцца грызунамі, дробнымі капытнымі, чарапахамі, птушкамі, рыбай, маладымі алігатарамі. На чалавека нападае рэдка. У засуху зарываецца ў глей і ўпадае ў спячку. Яйцажывародная (28—42 дзіцяняты). Выкарыстоўваюць скуру, мяса і тлушч.

**АНАКРУ́ЗА**, анакруса (грэч. anakrusis літар. адштурхоўванне), слабыя (ненаціскныя) склады перад першым метрычным націскам. У сілабатанічным вершаскладанні ў залежнасці ад метра А. бывае нулявая (харэй, дактыль), 1-складовая (ямб, амфібрахій) і 2-складовая (анапест). Унутраная структура роднасных памераў (1- і 2-складовых) аднолькавая, адрозніваюцца толькі А., што паказвае на яе рытмічнае значэнне. На гэтым заснаваны радковыя *лагаэды* — 2- і 3-складовыя памеры з раўнамерным чаргаваннем А. (напр., у паэмах Я.Купалы «Яна і я», «Безназоўнае»). А. часам наз. звышсхемныя ненаціскныя склады на пачатку вершаваных радкоў.

**АНАКРЭАНТЫ́ЧНАЯ ПАЭ́ЗІЯ**, лёгкая жыццярадасная лірыка, пазбаўленая суму і глыбокіх перажыванняў. Назва ад імя стараж.-грэч. паэта *Анакрэонта*, асн. матывамі песень якога былі каханне, бестурботная весялосць, віно. Анакрэантычныя вершы ў Францыі пісалі А.Шэнье, Вальтэр, П.Беранжэ; у Германіі — І.Глейм, Г.Лесінг; у Расіі — М.Ламаносаў, Г.Дзяржавін, К.Бацюшкаў, А.Пушкін і інш. У бел. паэзіі матывы А.п. ў лірыцы М.Багдановіча.

**АНАКРЭО́НТ**, Анакрэон (Anakreōn), старажытнагрэчаскі паэт-лірык сярэдзіны 6 ст. да н.э. Паходзіў з г. Тэас (М.Азія). Жыў на в-ве Самасе, потым у Афінах. Ствараў гімны, элегіі, эпіграмы, бяседныя песні. Вершы пісаў на іанійскім дыялекце стараж.-грэч. мовы. Паэзія А. вызначаецца жыццярадаснасцю, прыгажосцю формы і дасціпнасцю; асн. матывы — бестурботная весялосць, віно, каханне. Вершы на гэтыя тэмы пазней атрымалі назву анакрэантычных (гл. *Анакрэантычная паэзія*). Да творчасці А. часта звяртаўся М.Багдановіч.

*Тв.*: Рус. пер. — Первое полное собр. соч. в переводах русских писателей /Сост. А.Тамбовский. Спб., [1896]; у кн. Античная лирика. М., 1968. С. 71—79.

**АНАКСАГО́Р** (Anaxagoras) з Клазамен (каля 500—428 да н.э.), старажытнагрэчаскі філосаф. Заснаваў у Афінах першую прафес. школу філасофіі. З яго твораў захаваліся асобныя фрагменты. У цэнтры натурфілас. вучэння А. арыгінальная мадэль фізічнай рэальнасці: усё ў прыродзе складаецца з бясконцай колькасці бясконца падзельных часцінак (гамеамерый). Інертная матэрыя прыводзіцца ў рух розумам (нусам). Пазнанне свету адбываецца з дапамогай чалавечага розуму, які абапіраецца на адчуванні. Шэраг здагадак А. ў астраноміі і матэматыцы развіты навукай пазнейшага часу.

*Г.У.Грушавы.*

**АНАКСІБІЁЗ**, тое, што *анаэрабіёз*.

**АНАКСІМА́НДР** (Anaximandros) з Мілета (каля 610—546 да н.э.), старажытнагрэчаскі філосаф. Прадстаўнік іанійскай натурфіласофіі, паслядоўнік *Фалеса*. Аўтар твора «Пра прыроду» (не захаваўся). Лічыў, што асновай усяго існага з'яўляецца апейрон (вечная і бясконцая першаматэрыя), з якога ўзнікаюць усе рэчы і ў які вяртаюцца пасля сваёй гібелі; з яго ж вылучаюцца 2 асн. процілегласці: халоднае і цёплае, вільготнае і сухое, іх узаемадзеянне ўтварае рэчы і светы. А. даў фармулёўку закону захавання матэрыі. Паводле касмалагічнай тэорыі А., у цэнтры сусвету знаходзіцца нерухомая Зямля, існуе незлічоная колькасць светаў, размешчаных паслядоўна па часе і побач адзін з адным. Спрабаваў А. даць дыялект. тлумачэнне свету і жыцця, свабоднае ад міфалогіі, склаў першую геагр. карту, зрабіў першыя ў Грэцыі сонечны гадзіннік і астр. прыстасаванні.

**АНАКСІМЕ́Н**(Anaximenēs) з Мілета (каля 588 — каля 525 да н.э.), старажытнагрэчаскі філосаф-матэрыяліст. Ву-

чань *Анаксімандра*. Першаасновай усяго лічыў паветра: рэчы ўзнікаюць дзякуючы розным ступеням згушчэння паветра (утварэнне вады, зямлі, каменя і інш.) або яго разрэджвання (утварэнне агню). Паводле А., душа — гэта паветра, якое «атрымлівае» цела (працэс дыхання зберагае жыццё). Вызначыў розніцу паміж нерухомымі зоркамі і планетамі. Даў блізкае да навуковага тлумачэнне зацьменняў Сонца і Месяца.

**АНАКСІ́Я**, гл. ў арт. *Гіпаксія*.

**АНА́ЛАГАВАЯ ВЫЛІЧА́ЛЬНАЯ МАШЫ́НА** (АВМ), вылічальная машына, у якой апрацоўка інфармацыі выконваецца з дапамогай спецыяльна падабранага фіз. працэсу, што мадэлюе выліч. заканамернасць. Звычайна складаецца з сумататараў, інтэгравальных і дыферэнцыравальных элементаў і інш. У адрозненне ад *электроннай вылічальнай машыны* рашэнне атрымліваецца практычна імгненна пасля задання параметраў задачы; мае простую канструкцыю і праграмаванне, але невысокую дакладнасць вылічэнняў і меншую універсальнасць.

Папярэднікамі сучаснай АВМ можна лічыць лагарыфмічную лінейку, графікі і намаграмы (гл. *Намаграфія*) для вызначэння функцый некалькіх пераменных, упершыню прыведзеныя ў дапаможніках па навігацыі (1971), аналагавую прыладу (планіметр) англ. вучонага Дж.Германа для вызначэння плошчы, якая ўтворана замкнутай крывой на плоскасці (1814). Першая мех. АВМ для рашэння дыферэнцыяльных ураўненняў пры праектаванні караблёў прапанавана рус. вучоным А.М.Крыловым у 1904. Сав. матэматык С.А.Гершгорын (1927) заклаў асновы пабудовы сеткавых мадэляў АВМ.

Выкарыстоўваюцца АВМ для рашэння задач па апераджальным аналізе, аналізе дынамікі і сінтэзе сістэм кіравання і рэгулявання, у эксперыментальных даследаваннях паводзін сістэмы з апаратурай кіравання ці рэгулявання ў лабараторных умовах, пры вызначэнні ўзбурэння ці карысных сігналаў, што ўздзейнічаюць на сістэму і інш. АВМ, у якой лікавыя характарыстыкі мадэлявальнага фіз. працэсу выяўлены ў лічбавай форме, наз. гібрыднай вылічальнай машынай.

**«АНА́ЛАЎ» ШКО́ЛА**, кірунак у гістарыяграфіі, які склаўся ў Францыі вакол заснаванага ў 1929 час. «Annales d'histoire économique et sociale» [«Аналы эканамічнай і сацыяльнай гісторыі»; цяпер «Annales. Economies, sociétés, civilisations» («Аналы. Эканоміка, грамадства, цывілізацыі»)]. Стваральнікі і рэдактары часопіса — франц. гісторыкі М.*Блок* і Л.Феўр, іх пераемнікі — Ф.Брадэль, Ж.Ле Гоф, Э.Леруа Ладзюры, М.Феро і інш. Прадстаўнікі «А.» ш. засяроджваліся на глыбінных працэсах, якія рухаюць гісторыю, пашырылі паняцце сац. гісторыі, разумеючы гіст. чалавека не толькі ў межах яго паліт. паводзін, але і ў звычайным жыцці і сац. псіхалогіі. Разглядаюць гіст. падзею, факт, біяграфію гіст. дзеяча як прызму, праз якую можна больш поўна аднавіць карціну жыцця людзей мінулых эпох; вывучаюць ментальныя працэсы ў грамадстве. У цяперашні час «А.» ш. (наз. таксама «новая гіст. навука») — моцны інтэлектуальны рух, які аб'ядноўвае вучоных Францыі, ЗША, Англіі, Германіі, Аўстрыі, Італіі, Польшчы і інш. краін.

**АНАЛЕ́ПТЫКІ**, аналептычныя сродкі (ад грэч. analēptikos які аднаўляе), лекавыя прэпараты, што выкарыстоўваюцца для стымуляцыі дыхальных і сасуда-рухальных нерв. цэнтраў прадаўгаватага мозга, пры парушэннях дыхання і кровазвароту (кардыямін, каразол і інш.).

**АНА́ЛІЗ** (ад грэч. analysis раскладанне), спосаб (прыём) навук. пазнання праз мысленнае ці рэальнае расчляненне аб'екта пазнання (прадмета, з'явы, працэсу) на часткі і асэнсаванне іх узаемасувязі. Працэс А. — састаўная частка, першая ступень навук. даследавання. Канчатковы вынік — разуменне структуры аб'екта, які вывучаецца. Калі аб'ект з'яўляецца прадстаўніком пэўнага класа прадметаў, А. аднаго з іх дае магчымасць уявіць структуру ўсяго класа. Вынікі А. служаць матэрыялам для наступных ступеняў навук. пазнання — *абстракцыі, абагульнення, параўнання* і інш. А. — рухальная сіла ў выяўленні законаў, якім падпарадкоўваецца аб'ект даследавання. Карэктнасць А. правяраецца процілеглым яму прыёмам — *сінтэзам*. Калі пры гэтым выяўляецца супярэчнасць, А. паўтараецца з вылучэння новых гіпотэз аб структуры і ўласцівасцях састаўных частак аб'екта вывучэння. Калі паўторны А. паказаў неадольнасць супярэчнасцяў, то для выяўлення структуры аб'екта неабходны новы падыход. У логіцы сістэмны А. выкарыстоўваецца з часоў Арыстоцеля. Са з'яўленнем сімвалічнай логікі, кібернетыкі і семіётыкі выпрацавана найб. развітая форма лагічнага А. — пабудовы фармалізаваных моў.

*Літ.*: Пузиков П.Д. Анализ и синтез — от мысли к вещи. Мн., 1969; Андреев И.Д. Диалектическая логика. М., 1985; Hintikka J., Remes U. The method of analysis. Dordrecht; Boston, 1974.

*В.М.Пешкаў.*

**АНА́ЛІЗ ГАСПАДА́РЧАЙ ДЗЕ́ЙНАСЦІ**, сістэма комплекснага даследавання прычынна-выніковых сувязяў у дзейнасці суб'ектаў гаспадарання з мэтай выяўлення рэзерваў павышэння эфектыўнасці гэтай дзейнасці і выпрацоўкі аптымальных кіраўніцкіх рашэнняў; адна з асн. функцый у сістэме кіравання вытв-сцю на розных узроўнях — ад цэха прадпрыемства да мінва, карпарацыі. Ажыццяўляецца на аснове звестак *уліку* (уключаючы і *аператыўны ўлік*), дае магчымасць выявіць адхіленні паказчыкаў вытв.-гасп. дзейнасці ад запланаваных, вызначыць іх прычыны і прыняць неабходныя меры для рэгулявання вытв. працэсу і карэкціравання праграмы (плана). Аб'ект аналізу — вытв.-гасп. дзейнасць, прадмет — прычынна-выніковыя сувязі, што фарміруюць і змяняюць вынікі гэтай дзейнасці, метад — сістэмны і комплексны падыходы да даследавання аб'екта з выкарыстаннем адпаведных методык. У залежнасці ад узроўню і маштабу кіравання А.г.дз. бывае: унутрыгаспадарчы (унутрыфірменны), галіновы, міжгаліновы ці рэгіянальны, народнагаспадарчы. У залежнасці ад віду кіравання вытв-сцю вылучаюць: *аператыўны аналіз* гасп. дзейнасці (для аператыўнага ці кароткатэрміновага кіравання), бягучы ці перыядычны аналіз (для бягучага ці сярэднетэрміновага кіравання), перспектыўны ці доўгатэрміновы аналіз (для пэўнай мэтавай сістэмы). У навук. л-ры вылучаюць і інш. віды А.г.дз.: у залежнасці ад абагульнення аб'екта даследавання (агульнаэканам. аналіз) ці яго дзялення (фін. аналіз), вылучэння асобных яго мэтаў (прагнозны аналіз) ці пераважных спосабаў даследавання (параўнальны аналіз).

*В.І.Стражаў.*

**АНА́ЛІЗ МАТЭМАТЫ́ЧНЫ**, сукупнасць раздзелаў матэматыкі, якія даследуюць функцыі метадамі бесканечна малых. У сістэм. форме ўзнік у 17—18 ст. у працах І.Ньютана, Г.Лейбніца, Л.Эйлера і інш. Абгрунтаванне А.м. пры дапамозе паняцця ліміту належыць А.Кашы. Уключае раздзелы: дыферэнцыяльнае злічэнне, інтэгральнае злічэнне, функцыі тэорыю, тэорыю шэрагаў (*ступенны шэраг* і *Фур'е шэраг*), *дыферэнцыяльную геаметрыю, функцыянальны аналіз* і інш.

*Літ.*: Фихтенгольц Г.М. Курс дифференциального и интегрального исчисления. Т. 1—2. 7 изд. М., 1970; Т. 3. 5 изд. М., 1970; Никольский С.М. Курс математического анализа. Т. 1—2. 4 изд. М., 1990—91.

**АНА́ЛІЗ ХІМІ́ЧНЫ**, сукупнасць метадаў навук. даследавання, заснаваных на выкарыстанні хім. рэакцый; расшыфроўка структуры і саставу хім. злучэнняў ці рэчываў арган. і неарган. прыроды, колькаснага і якаснага іх вызначэння. Уключае *колькасны аналіз* і *якасны аналіз*. «Класічны» А.х. (гравіметрычны, цітрыметрычны, газавы і інш.) грунтуецца на выкарыстанні рэакцый асаджэння, *нейтралізацыі*, комплексаўтварэння, акіслення-аднаўлення, сучасны — на вывучэнні фізіка-хім., фіз. уласцівасцяў рэчываў метадамі *спектраскапіі, мас-спектраметрыі*, радыехім., радыяцыйнымі, электрахім., што дазваляе атрымліваць комплексную інфармацыю аб хім. злучэннях і рэчывах, аўтаматызаваць аналітычны кантроль працэсаў у вытв-сці, а таксама кантроль сыравіны, гатовай прадукцыі, вады, паветра і г.д.

**АНАЛІЗА́ТАР,** 1) у оптыцы — прыстасаванне для выяўлення характару палярызацыі святла. Лінейныя А. служаць для выяўлення лінейна (плоска) палярызаванага святла і вызначэння становішча яго плоскасці палярызацыі, ступені палярызацыі часткова палярызаванага святла. Як А. выкарыстоўваюць палярызацыйныя прызмы, паляроіды, пласцінкі турмаліну і інш. А. для святла з кругавой і эліптычнай палярызацыяй звычайна складаюцца з аптычнага кампенсатара і лінейнага А. Гл. таксама *Палярызатар.* 2) у прамысловасці — прылада ці вымяральнае прыстасаванне хім. саставу газаў, вадкасцяў, цвёрдых і сыпкіх рэчываў. Паводле метаду аналізу бываюць цеплавыя, магн., мех., хім., электрахім., аптычныя, радыеізатопныя і інш.

**АНАЛІЗА́ТАРЫ** ў біялогіі, *Сенсорныя сістэмы.*

**АНАЛІ́СТЫ,** першыя старажытнарымскія гісторыкі. Гіст. падзеі размяшчалі па гадах праўлення консулаў. Творы А. (*аналы*) апавядалі пераважна пра паліт. і ваен. падзеі, былі прасякнуты патрыятызмам. Найб. вядомыя А.: Квінт Фабій Піктар (3 ст. да н.э.), Катон Старэйшы (2 ст. да н.э.). Урыўкі з твораў А. выкарыстаны ў працах больш позніх гісторыкаў.

**АНАЛІТЫ́ЧНАЕ СКРЫЖАВА́ННЕ,** скрыжаванне гібрыда 1-га пакалення з бацькоўскай формай-«аналізатарам», якая мае рэцэсіўныя прыкметы (гомазіготная па рэцэсіўных *алелях*). Праводзіцца з мэтай вызначэння *генатыпу* гібрыднай асобіны па характары атрыманага патомства. Патомкі ад А.с. абавязкова нясуць адзін рэцэсіўны алель ад «аналізатара», на фоне якога павінны праявіцца алелі, атрыманыя ад аналізуемага арганізма. Для А.с. (за выключэннем выпадкаў узаемадзеяння генаў) характэрна супадзенне расшчапления па *фенатыпе* з расшчапленнем па генатыпе сярод патомкаў. З дапамогай А.с. можна вызначыць, да якога тыпу належыць праведзенае скрыжаванне: да мона- або дыгібрыднага. Гл. таксама *Скрыжаванне.*

**АНАЛІТЫ́ЧНАЯ ГЕАМЕ́ТРЫЯ,** раздзел геаметрыі, у якім уласцівасці геаметрычных аб'ектаў (пунктаў, ліній, паверхняў) даследуюцца сродкамі алгебры на падставе метаду каардынат (праз вывучэнне ўласцівасцяў ураўненняў, графікамі якіх гэтыя аб'екты з'яўляюцца).

Узнікненне метаду каардынат звязана з развіццём у 17 ст. астраноміі, механікі, тэхнікі. Асновы А.г. заклалі Р.Дэкарт (1637) і П.Ферма (1629); далейшае развіццё звязана з працамі Г.Лейбніца, І.Ньютана, Л.Эйлера, Ж.Лагранжа, Г.Монжа, С.Лакруа і інш. Асн. задача А.г. на плоскасці — даследаванне ліній 1-га (прамыя) і 2-га (эліпс, гіпербала, парабала) парадку, якія ў дэкартавых каардынатах вызначаюцца алг. ураўненнямі адпаведна 1-й і 2-й ступені. А.г. ў прасторы даследуе паверхні 1-га (плоскасці) і 2-га (эліпсоід, гіпербалоід, парабалоід, конус, цыліндр) парадку, якія вызначаюцца алг. ураўненнямі адносна дэкартавых каардынат адпаведна 1-й і 2-й ступені.

Метад даследавання і класіфікацый ліній і паверхняў прадугледжвае адшуканне такой прамавугольнай сістэмы каардынат, у якой адпаведнае ўраўненне набывае найб. просты выгляд. Метадамі А.г. карыстаюцца ў матэматыцы, фізіцы, механіцы, тэхніцы і інш. На Беларусі значны ўклад у развіццё А.г. зрабілі У.К.Дыдырка («Цыркулярныя крывыя 3-га парадку» — 1-я на Беларусі матэм. манаграфія, 1928) і І.К.Багаяўленскі («Аналітычная геаметрыя» — 1-ы беларускамоўны падручнік па вышэйшай матэматыцы, 1932).

*Літ.:* Тышкевич Р.И., Феденко А.С. Линейная алгебра и аналитическая геометрия. 2 изд. Мн., 1976. *А.А.Гусак.*



Да арт. **Аналізатар.** Аптычная схема цукрамера: *S* — крыніца святла; *D1, D2* — дыяфрагмы; *O1* — аб'ектыў; 1 — палярызатар; 2 — трубка з растворам цукру; 3 — кампенсатар; 4 — аналізатар; *O2* + *OR* — зрокавая труба; *S* — шкала; *O3* — акуляр шкалы.

**АНАЛІТЫ́ЧНАЯ МЕХА́НІКА,** раздзел механікі, у якім рух сістэм матэрыяльных пунктаў (цел) даследуецца пераважна метадамі матэм. аналізу. Вывучае складаныя мех. сістэмы (машыны, механізмы, сістэмы часціц і інш.), рух якіх абмежаваны пэўнымі ўмовамі (гл. *Сувязі механічныя*).

Галаномная сістэма (мех. сувязі залежаць толькі ад каардынат і часу) у патэнцыяльным полі характарызуецца функцыяй Лагранжа L=T-U, дзе T — кінетычная і U — патэнцыяльная энергія сістэмы. Калі вядома канкрэтная залежнасць L=L(q,q̇,t), дзе q — абагульненыя каардынаты, $\dot{q}=\frac{dq}{dt}$ — абагульненыя скорасці, t — час, то пры дапамозе прынцыпу найменшага дзеяння можна знайсці дыферэнцыяльныя ўраўненні руху мех. сістэмы. Іх інтэграванне пры зададзеных пачатковых умовах дазваляе вызначыць закон руху сістэмы, г.зн. залежнасці $q_i=q_i(t)$, дзе i=1, 2, ..., S, S — лік ступеняў свабоды.

Асн. палажэнні А.м. распрацаваў Ж.Лагранж (1788), значны ўклад зрабілі У.Гамільтан, М.В.Астраградскі, П.Л.Чабышоў, А.М.Ляпуноў, М.М.Багалюбаў, А.Ю.Ішлінскі і інш. Метады А.м. далі магчымасць выявіць сувязь паміж асн. паняццямі механікі, оптыкі і квантавай механікі (оптыка-мех. аналогіі). Абагульненне варыяцыйных прынцыпаў механікі на неперарыўныя квантава-рэлятывісцкія сістэмы склала матэм. аснову тэорыі поля. Дасягненні А.м. садзейнічалі развіццю балістыкі, нябеснай механікі, тэорыі ўстойлівасці, тэорыі аўтам. кіравання і інш.

*Літ.:* Кильчевский Н.А. Курс теоретической механики. Т. 2. М., 1977. *А.І.Болсун.*

**АНАЛІТЫ́ЧНАЯ ПСІХАЛО́ГІЯ,** тэорыя, заснаваная на вучэнні пра наяўнасць у псіхіцы чалавека апрача індывідуальнага неўсвядомленага больш глыбокага слоя — калектыўнага неўсвядомленага. Змест калект. неўсвядомленага складаюць агульначалавечыя першавобразы — *архетыпы*, у якіх закладзены варыянты разумення свету і паводзін. Распрацавана ў 1910-я г. швейц. псіхолагам К.Г.Юнгам. Мэтай працэсу станаўлення асобы (індывідуацыі) з'яўляецца інтэграцыя зместу калект. неўсвядомленага, імкненне да ўзаемаразумення паміж трыма ўзроўнямі псіхікі: свядомым, індывід. неўсвядомленым, калект. неўсвядомленым. Гэта бясконцы шлях у самім сабе, з адкрыццём патаемных куткоў душы, якая складаецца з супярэчнасцяў: жаночае і мужчынскае, свядомае і неўсвядомленае і інш. Розныя прычыны, найперш сац., дазваляюць рэалізоўвацца толькі аднаму члену пары, а індывідуацыя дазваляе адкрыць у сабе другі бок і прыняць яго, інакш — крызіс, хвароба, няма развіцця. Усё яшчэ чалавек ідзе да адкрыцця самага гал. архетыпу — «вобраза сябе як Бога ў сабе».

*Літ.:* Юнг К.Г. Психологические типы: Пер. с англ. М., 1992; Ягож. Проблемы души нашего времени: Пер. с англ. М., 1993; Ягож. Аналитическая психология: Пер. с англ. Спб., 1994. *Т.У.Васілец.*

**АНАЛІТЫ́ЧНАЯ ФІЛАСО́ФІЯ,** кірунак у філасофіі 20 ст., гал. чынам у англамоўных краінах. Развівалася ў рэчышчы неапазітывізму. Асн. задачу філас. даследавання зводзіла пераважна да аналізу моўных сродкаў пазнання, а філасофска-гнасеалагічную праблематыку — да прыватна-навук. праблем, якія вырашаюцца сродкамі і метадамі логікі, лінгвістыкі, семіётыкі і інш. Класічную філасофію абвяшчае «метафізікай», пазбаўленай навук.-пазнавальнага сэнсу. Метад аналізу, што ўкараніўся ў А.ф., бярэ пачатак ад даследаванняў Дж.Мура і Б.Расела. У распрацоўку А.ф. зрабілі ўклад Л.Вітгенштэйн і прадстаўнікі «Венскага гуртка». Асн. плыні: філасофія лагічнага аналізу, якая сродкі аналізу бярэ ў сучаснай матэм. логіцы і арыентуецца пераважна на «мову навук» (Р.Карнап, Г.Фейгль і інш.), і лінгвістычная філасофія, што даследуе тыпы ўжывання выразаў у натуральнай паўсядзённай мове, замяняючы фармальна-лагічныя сродкі аналізу лінгвістычнымі і адмаўляючыся ад культу навук. ведаў (Г.Райл, Дж.Осцін і інш.). Абедзве плыні імкнуцца культываваць аналіз як чыстую тэхніку, якая лёгка ўключаецца ў кантэкст розных філас. вучэнняў (экзістэнцыялізм, неатамізм і інш.).

*Літ.:* Бегиашвили А.Ф. Метод анализа современной буржуазной философии.

Тбилиси, 1960; Козлова М.С. Философия и язык. М., 1972 *Г.У.Грушавы.*

**АНАЛІТЫ́ЧНАЯ ФУ́НКЦЫЯ**, функцыя, значэнне якой у кожным пункце яе вобласці вызначэння роўнае суме *ступеннага шэрага*, які збягаецца ў некаторым наваколлі гэтага пункта. Да А.ф. адносяцца: *рацыянальная функцыя, паказнікавая функцыя, лагарыфмічная функцыя, трыганаметрычныя функцыі, адваротныя трыганаметрычныя функцыі*, іх разнастайныя кампазіцыі, а таксама функцыі, адваротныя да гэтых кампазіцый. Існуюць А.ф. аднаго або некалькіх рэчаісных ці камплексных пераменных. Функцыя f(z) аднаго камплекснага пераменнага z=x+iy наз. А.ф. у пункце $z_0$, калі ў некаторым наваколлі h гэтага пункта існуе канечная вытворная $f'(z)=\lim_{h\to 0}\frac{f(z+h)-f(z)}{h}$ (дыферэнцыравальнасць функцыі), што мае месца ў тым і толькі ў тым выпадку, калі выконваецца ўмова Кашы—Рымана $\frac{dt}{d\bar{z}}=0$, дзе $\bar{z}$=x-iy. Асновы тэорыі А.ф. былі закладзены А.Кашы, Б.Рыманам і К.Вейерштрасам, С.В.Кавалеўскай і інш. На Беларусі даследаванні па тэорыі А.ф. пачаліся ў 1930-я г. ў БДУ (М.В.Ламбін, М.Л.Лукомская), з 1960-х г. праводзяцца ў АН, БДУ і інш. ВНУ рэспублікі (Ф.Дз.Гахаў, Э.І.Звяровіч і інш.). А.ф. маюць шматлікія дастасаванні ў матэм. аналізе (вылічэнне вызначаных інтэгралаў), у геаметрыі (канформныя адлюстраванні), у тэорыі пругкасці, гідрадынамікі, электрадынамікі і інш. навуках. Гл. таксама *Кашы інтэграл, Кашы тэарэма.*

*Літ.* Маркушевич А.И. Теория аналитических функций. Т. 1—2. М., 1967—68; Шабат Б.В. Введение в комплексный анализ. Ч. 1—2. 3 изд. М., 1985; Гахов Ф.Д. Краевые задачи. 3 изд. М., 1977. *Э.І.Звяровіч.*

**АНАЛІТЫ́ЧНАЯ ХІ́МІЯ**, навука аб прынцыпах і метадах вывучэння саставу рэчываў. Уключае тэарэт. асновы хім. аналізу, метады вызначэння кампанентаў у рэчывах ці матэрыялах, сістэм. аналіз канкрэтных аб'ектаў. Тэарэт. асновы А.х. — метралогія хім. аналізу (апрацоўка вынікаў); вучэнне аб адборы і падрыхтоўцы аналітычных проб, складанні схемы і выбары метадаў, прынцыпах і шляхах аўтаматызацыі аналізу. А.х. звязана з дасягненнямі фізікі, матэматыкі, біялогіі, розных галін тэхнікі. Асаблівасць А.х. — вывучэнне індывід. спецыфічных уласцівасцяў і характарыстык аб'ектаў. У залежнасці ад мэты аналізу адрозніваюць *якасны аналіз* і *колькасны аналіз*; у залежнасці ад кампанентаў, якія неабходна выявіць — ізатопны аналіз, *элементны аналіз*, структурна-групавы (у т.л. *функцыянальны аналіз*), малекулярны і фазавы аналіз; у залежнасці ад прыроды рэчыва — аналіз арган. і неарган. рэчываў. Вызначэнне рэчыва ці кампанента праводзяць хімічнымі (*гравіметрычны аналіз, цітрыметрычны аналіз*), фізікахімічнымі (электрахім., *фотаметрычны аналіз, кінетычныя метады аналізу*), фізічнымі (спектральныя, ядзерна-фіз. і інш.) і біял. метадамі аналізу. Практычна ўсе метады А.х. заснаваны на залежнасці ўласцівасцяў аб'ектаў, якія можна мераць (маса, аб'ём, святлопаглынанне, эл. ток і інш.), ад іх саставу.

Заснавальнікам А.х. як навукі лічыцца Р.Бойль, які ўвёў паняцце «хімічны аналіз». Класічная А.х. (17—18 ст.) выкарыстоўвала пераважна гравіметрычны і цітрыметрычны метады аналізу. Да 1-й пал. 19 ст. адкрыты многія хім. элементы, выдзелены састаўныя часткі некаторых прыродных рэчываў, устаноўлены *пастаянства саставу закон, кратных адносін закон, масы захавання закон.* Распрацаваны сістэматычны аналіз (ням. хімікі Г.Розе, К.Фрэзеніус і рус. хімік М.А.Мяншуткін), створаны цітрыметрычны аналіз арган. злучэнняў (ням. хімік Ю.Лібіх). У канцы 19 ст. складалася тэорыя А.х., заснаваная на вучэнні аб хім. раўнавазе ў растворах з удзелам іонаў (у асн. В.Оствальд). У 20 ст. з'явіліся метады мікрааналізу арган. злучэнняў (аўстр. хімік Ф.Прэгль), паляраграфіі (чэшскі хімік Я.Гейраўскі), рус. біяхімікам М.С.Цветам адкрыты метад храматаграфіі (1903) і створаны яго варыянты. Развіццё сучаснай А.х. звязана са з'яўленнем мноства фізіка-хім. і фіз. метадаў аналізу (мас-спектраметрычны, рэнтгенаўскі, ядзерна-фізічныя). Прапанаваны плазмавыя крыніцы току для атамна-эмісійнага аналізу, распрацаваны метады фотаметрычнага аналізу, атамна-адсарбцыйнай спектраскапіі. У сувязі з неабходнасцю аналізу ядз., паўправадніковых і інш. матэрыялаў высокай чысціні створаны *радыеактывацыйны аналіз*, хімічна-спектральны, іскравая *мас-спектраметрыя*, вольтамперметрыя — метады, што дазваляюць вызначыць дамешкі ў чыстых рэчывах з канцэнтрацыяй да $10^{-7}$—$10^{-8}$%. Распрацаваны метады неперарыўнага і дыстанцыйнага аналізу. Перавага аддаецца метадам неразбуральнага кантролю, лакальнага аналізу (рэнтгенаспектральны мікрааналіз, мас-спектраметрыя другасных іонаў і інш.). Лакальным аналізам карыстаюцца пры аналізе паверхневых слаёў цвёрдых матэрыялаў ці ўключэнняў горных парод.

Сучасная А.х. карыстаецца аўтам. ці аўтаматызаванымі варыянтамі вызначэння рэчываў. Метады А.х. дазваляюць кантраляваць тэхнал. працэсы і якасць прадукцыі ў многіх галінах вытв-сці, праводзіць пошук і разведку карысных выкапняў. А.х. садзейнічала развіццю ат. энергетыкі, электронікі, акіяналогіі, біялогіі, медыцыны, крыміналістыкі, археалогіі, касм. даследаванняў. На Беларусі сістэм. даследаванні па А.х. пачаліся ў 1935 у БДУ і вядуцца ў ін-тах фіз., хім. і геал. профілю АН, у ВНУ і ведамасных н.-д. установах. Распрацаваны шэраг храматаграфічных метадаў, выдзялення з сумесяў і вызначэння іонаў, комплексаў металаў, алкалоідаў і інш. рэчываў (пад кіраўніцтвам Р.Л.Старобінца); хім. метадаў вызначэння металаў (В.Р.Скараход); даследаваны ўплыў экстракцыйных працэсаў розных тыпаў на функцыянаванне вадкасных і плёначных іонаселектыўных электродаў на аснове вышэйшых чацвярцічных амоніевых соляў (Я.М.Рахманько) і сульфакіслот (У.У.Ягораў). Распрацаваны і ўкараненыя: аніён- і катыёнселектыўныя электроды; нітратамер і іонамер; методыкі вызначэння нітратаў, свінцу, кадмію, вісмуту, ртуці, цынку, алкалоідаў, алкілсульфатаў і інш., газахраматаграфічнага вызначэння фенолаў, пестыцыдаў у вадзе, прадуктах харчавання; экстракцыйна-спектральныя і храматаграфічныя метады аналізу с.-г. аб'ектаў; метады аналізу паўправадніковых матэрыялаў, сплаваў, плёнак, ферытаў.

*Літ.:* Золотов Ю.А. Аналитическая химия: Проблемы и достижения. М., 1992.

**АНАЛІТЫ́ЧНЫ ЎЛІ́К**, дэталізаваны бухгалтарскі ўлік гасп. аперацый і сродкаў прадпрыемстваў, арг-цый, устаноў з дапамогай аналітычных рахункаў. Ажыццяўляецца ў натуральных і вартасных паказчыках, для аператыўнага кіравання і справаздачнасці. Дае магчымасць аператыўна сачыць за наяўнасцю кожнага віду таварна-матэрыяльных каштоўнасцяў, за разлікамі з пастаўшчыкамі, падрадчыкамі, дэбіторамі, крэдыторамі, падсправаздачнымі асобамі і інш. Па звестках А.ў. можна рабіць справаздачныя калькуляцыі сабекошту прадукцыі, а па натуральных паказчыках выяўляць лішкі ці недахоп сродкаў.

**АНАЛІТЫ́ЧНЫЯ МО́ВЫ**, мовы, у якіх граматычныя значэнні выражаюцца не формамі слоў (як у *сінтэтычных мовах*), а гал. чынам службовымі словамі, парадкам слоў, інтанацыяй і інш. Да А.м. належаць англ., франц., новаперс., балг. і інш. мовы. Аналітычныя спосабы часткова выкарыстоўваюцца і сінтэтычнымі мовамі, у т.л. і бел., напр. пры ўтварэнні складаных формаў ступеняў параўнання прыметнікаў і прыслоўяў («самы цікавы», «больш прыгодны», «надзвычай вясёлы», «найбольш поўна»), будучага і прошлага часу дзеясловаў («буду пісаць», «пайшоў быў»), загаднага ладу («давай спяваць», «няхай квітнее»), складаных тыпаў выказніка («працаваць аграномам», «станавіцца мацнейшым»). Гл. таксама *Тыпалагічная класіфікацыя моў.*

**АНАЛО́ГІЯ** (ад грэч. anālōgia адпаведнасць, падабенства), 1) прыём (метад) выяўлення падабенства паміж прадметамі, іх уласцівасцямі і якасцямі. Усе прадметы прыроды (ад элементарных часціц і да касм. аб'ектаў) распадаюцца на пэўныя групы і класы, якія маюць агульныя ўласцівасці і прыкметы — А. Прыём А. скарачае тэрміны даследаванняў і часам прыводзіць да навук. адкрыццяў, разам з тым ён можа быць крыніцай памылак, калі выкарыстаны некрытычна ці будуецца на выпадковых падабенствах і прыкметах (атаясамленне грамадства і арганізма, арганізма і механічнай сістэмы, сумленне і камп'ютэра, некаторых А. у гіст., сацыялагічным, паліталагічным і эканам. даследаваннях). Прыёмы А., маючы значныя пазнавальныя магчымасці, павінны дапаўняцца іншымі метадамі даследавання. А. шырока выкарыстоў-

ваецца ў фізіцы, матэматыцы, псіхалогіі і інш. (напр., падабенства ў паводзінах святла і гуку прывяло да вываду, што святло мае хвалепадобную прыроду). 2) У біялогіі — марфалагічнае падабенства органаў або іх частак розных па паходжанні, але аднолькавых па функцыях. А. развіваецца ў выніку *канвергенцыі*. Органы, якія выконваюць аднолькавыя або блізка падобныя функцыі, наз. аналагічнымі (напр., крылы птушак і насякомых, шчэлепы рыб і ракаў). Развіццё іх сведчыць толькі аб прыстасаванасці органаў да аднолькавых умоў існавання, а не аб эвалюцыйным падабенстве (гл. *Гамалогія*). 3) У моваznаўстве — утварэнне моўнай адзінкі шляхам прыпадабнення да адзінак і адносін, якія ўжо існуюць у мове. Так, форма «яблыняў» замест «яблынь» ужываецца па А. з формамі «лічбаў», «вербаў» (канчатак «-аў» абумоўлены збегам зычных), што таксама ўтварыліся на ўзор стараж. формаў «сыноў», «дамоў». Найб. характэрна А. ў граматыцы, дзе яна выраўноўвае формы слоў, што вылучаюцца з агульнага рада, і вядзе да уніфікацыі (напр., «ядзім» як «глядзім» замест больш архаічнага «ямо»). А. ўзнікае ў жывым маўленні, з цягам часу можа быць замацавана ў нармаванай моўнай сістэме. 4) У праве — прыём вырашэння дзярж., гаспадарчымі, грамадскімі і інш. органамі, службовымі асобамі і грамадзянамі юрыд. пытанняў, не ўрэгуляваных нормамі права. Адрозніваюць А. закону — дастасаванне ў вырашэнні пэўных пытанняў прававых нормаў, якія рэгулююць падобныя грамадскія адносіны, і А. права — прымяненне агульных асноў і прынцыпаў прававога рэгулявання адпаведнай галіны права ці прававога інстытута. На Беларусі А. выкарыстоўвалася на розных этапах развіцця дзяржаўнасці і права. Сучаснае заканадаўства Рэспублікі Беларусь поўнасцю забараняе А. ў крымін. праве, але дазваляе ў цывільных праваадносінах, у адм., прац., гасп. і інш. галінах права. А. выкарыстоўваецца ў некат. замежных краінах. Напр., у краінах англа-саксонскай сістэмы права (ЗША, Вялікабрытанія) дапускаецца А. крымін. закону пры дапамозе т.зв. *прэцэдэнту*.

*А.М.Елсукоў, А.А.Кожынава, В.А.Кадаўбовіч.*

**АНАЛО́ГІЯ БЫЦЦЯ́**, адно з асноўных паняццяў каталіцкай філасофіі — *тамізму*, паводле якога Бог і ўсё ім створанае знаходзяцца ў суадносінах з агульным для іх быццём. Фама Аквінскі ўзвёў А.б. ў фундаментальны прынцып гэтай дактрыны і распрацаваў яго філас. змест. У 20 ст. ўклад у распрацоўку А.б., вызначэнне сфер і магчымасцяў выкарыстання зрабілі Э.Пшывара, Ф. Ван Стэенберген, Б.Лакебрынк, К.Ранер. Сутнасць А.б. ў тым, што паміж Богам і яго тварэннямі існуюць першапачатковыя адносіны падабенства ў адрозненнях і адрозненні ў падабенстве. Таму адносіны аналогіі могуць пераважаць толькі там, дзе няма ні поўнага падабенства, ні поўнага адрознення, а спалучаюцца адно з адным. Першасным, вызначальным прызнаецца падабенства, першакрыніца якога — стварэнне Богам сусвету і ўсяго, што ў ім існуе. Гэта дае магчымасць філас.-тэалагічнымі сродкамі абгрунтоўваць быццё Бога як першакрыніцу створанага сусвету розных падабенстваў, сярод якіх самае набліжанае да творчай магутнасці стваральніка — творчая дзейнасць чалавека. Але яе нельга атаясамліваць з творчым актам стварэння, бо яна толькі набліжаецца да яго паводле падабенства (аналогіі). *Я.М.Бабосаў.*

**АНАЛО́Й**, налой (грэч. analogeion), адмысловы столік са скошанай накрыўкай, на які кладуць абразы ці богаслужэбныя кнігі ў час іх чытання ў правасл. храмах.



Аналъцым.

**АНА́ЛЫ** (ад лац. annales гадавыя), запіс найб. значных падзей па гадах; форма гіст. твора ў старажытнасці і сярэднявеччы. Тэрмін А. ўзнік у Стараж. Рыме, дзе ўсе важныя падзеі штогод запісваліся пантыфікамі (жрацамі) на спец. дошках і выстаўляліся на ўсеагульны агляд. А. наз. таксама творы *аналістаў*. Пасля назва перайшла і на сярэдневяковыя запісы, якія вяліся звычайна ў манастырах. Форма пагадовых запісаў выкарыстана ў *хроніках* і *летапісах*.

**АНА́ЛЬНЫЯ ЗАЛО́ЗЫ**, скурныя *апакрынныя залозы* млекакормячых, якія адкрываюцца каля анальнай адтуліны або ў поласць задняй кішкі; вытворныя потавых і тлушчавых залозаў. Асн. функцыя — выдзяленне пахучых рэчываў, з дапамогай якіх жывёлы пазначаюць сваю тэрыторыю. Выдзяленні некаторых драпежнікаў (скунса, норкі) маюць сакрэт з рэзкім, непрыемным, устойлівым пахам, які адпужвае ворага або прываблівае асобін процілеглага полу.

**АНАЛЬЦЫ́М** (ад грэч. analkis слабы), пародаўтваральны мінерал падкласа каркасных сілікатаў (група цэалітаў), $Na_2[AlSi_2O_6]_2.2H_2O$. Крышталізуецца ў кубічнай сінганіі. Крышталі, зярністыя масы, друзы, жэоды і інш. Бясколерны ці белы, шэры, зеленаваты, ружовы. Празрысты да амаль непразрыстага. Бляск шкляны. Цв. 5,5—6; крохкі. Шчыльн. 2,2—2,3 г/см$^3$. Па паходжанні гідратэрмальны, радзей магматычны, таксама аўтыгенны мінерал у азёрных адкладах, гліністых сланцах, пясчаніках. На Беларусі выяўлены ў значнай колькасці (да 20—30%) у пародах верхняга пратэразою, як акцэсорны мінерал — у адкладах дэвону, карбону і інш.

**АНАМАЛІСТЫ́ЧНЫ ГОД**, гл. ў арт. *Год*.

**АНАМА́ЛІЯ** (грэч. anōmalia), 1) адхіленне ад нормы, ад агульнай заканамернасці, ненармальнасць. 2) У біялогіі і медыцыне — адхіленне ў будове ці функцыях асобнага органа або ўсяго арганізма, абумоўленае парушэннямі яго эмбрыянальнага развіцця. Могуць быць звязаны з ускладненай спадчыннасцю, пашкоджаннем зародка пад уплывам мех., інфекц., таксікагенных, радыяцыйных і інш. фактараў. Напр., шасціпальцасць, парок сэрца, заечая губа, альбінізм, гемафілія. Крайняя форма А. — *пачварнасць*. 3) У метэаралогіі — адхіленне велічыні пэўнага метэаралагічнага элемента ў пэўным месцы ад нормы. Адрозніваюць адхіленне ад шматгадовай сярэдняй велічыні (напр., сярэдняй т-ры месяца за асобны год) і шматгадовай сярэдняй велічыні таго ж элемента для ўсяго шыротнага круга, дзе знаходзіцца гэтае месца (напр., для 55° паўн. ш.). Размеркаванне А. вывучаецца з дапамогай картаў ізанамал (лініі, што злучаюць пункты з аднолькавымі велічынямі). А. бываюць адмоўныя, калі велічыня меншая за сярэднюю шматгадовую, і дадатныя, калі велічыня большая. На Беларусі (Мінск) адмоўная А. сярэднямесячнай т-ры паветра 6,3 °С, дадатная 5,5 °С. Асабліва вял. тэмпературныя А. ўласцівы мацерыкам Паўн. паўшар'я (напр., зімой у Верхаянску адмоўная А. складае 26 °С, у Паўн. Амерыцы — 16 °С).

**АНАМАРФАВА́ННЕ** (ад грэч. anamorphoō пераўтвараю) відарысаў, пераўтварэнне канфігурацыі відарыса аб'екта спец. аптычнымі сістэмамі або ўзаемным нахілам плоскасці прадмета і экрана. А. аптычнымі сістэмамі (напр., анамарфотнай насадкай) пашырана ў шырокаэкранным кінематографе для сціскання (пры здымцы) і расцягнення (пры праектаванні на экран) відарыса ў гарыз. напрамку. А. нахілам выкарыстоўваюць у фатаграфіі (для змяншэння перспектыўных скажэнняў), у паліграфіі і інш.

**АНАМАСІЯЛО́ГІЯ** (ад грэч. onomasia называнне + ...*логія*), навука аб наймен-

ніях, адзін з раздзелаў *семантыкі*. Займаецца пытаннямі *намінацыі*, аналізам спосабаў і сродкаў стварэння намінатыўных адзінак на розных узроўнях мовы, высвятленнем унутранай формы назваў у розных мовах для абазначэння аднаго і таго ж паняцця, зменай назваў у працэсе гіст. развіцця мовы і інш.

А. пачала фарміравацца ў самаст. навуку ў 20 ст. (працы ням. і аўстр. вучоных — заснавальнікаў лінгвістычнага кірунку «Словы і рэчы» Р.Мерынгера, Г.Шухарта, прадстаўнікоў тэорыі семантычных палёў Л.Вайсгербера, К.Бальдзінгера, працы вучоных Пражскага лінгвістычнага гуртка, рус. мовазнаўцаў). У анамасіялагічным аспекце лексіку разглядаюць у этымалагічных слоўніках (у т.л. «Этымалагічным слоўніку беларускай мовы», т. 1—8, 1978—93). Анамасіялагічны аналіз выкарыстоўваюць пры аналізе *тапанімікі*. *Л.М.Ляшчова.*

**АНАМА́СТЫКА** (ад грэч. onomastikos які адносіцца да найменняў), 1) сукупнасць уласных імёнаў (анімія). 2) Раздзел *мовазнаўства*, які вывучае паходжанне, развіццё, структуру, функцыянаванне і пашырэнне ўласных імёнаў. А. падзяляецца на раздзелы ў адпаведнасці з катэгорыямі аб'ектаў, што носяць уласныя імёны: антрапаніміка (вывучае ўласныя асабовыя імёны, імёны па бацьку і прозвішчы людзей, імёны-мянушкі, псеўданімы), *тапаніміка*, тэаніміка (імёны багоў, міфал. істот), зааніміка (клічкі жывёл), касманіміка (назвы зон касм. прасторы, галактык і сузор'яў), астраніміка (назвы асобных нябесных целаў) і інш. У залежнасці ад моўных асаблівасцяў уласных імёнаў вылучаюць А. літаратурную і дыялектную, рэальную і паэтычную (або маст. тэкстаў), сучасную і гіст., тэарэт. і прыкладную. Анамастычны матэрыял — своеасаблівы хавальнік шматлікіх, часта не зафіксаваных інш. крыніцамі фактаў гісторыі, культуры і мовы народа. Уласнымі імёнамі вучоныя цікавіліся з даўніх часоў, але як навука А. сфарміравалася ў 1930-я г. У 1949 у Бельгіі створаны Міжнар. анамастычны камітэт пры ЮНЕСКА (з 1950 выдае час. «Onoma»). У развіццё А. зрабілі ўклад бел. мовазнаўцы Я.М.Адамовіч, Л.А.Акаловіч, М.В.Бірыла, В.П.Лемцюгова, М.Р.Суднік, Г.К.Усцінавіч, І.Я.Яшкін.

*Літ.*: Бірыла М.В., Лемцюгова В.П. Анамастычныя словаўтваральныя элементы ва ўсходне- і заходнеславянскіх мовах. Мн., 1973; Перспективы развития славянской ономастики. М., 1980.

**АНАМІ́Я** (ад франц. anomie адсутнасць закону), стан грамадства, калі значная частка людзей ведае пра існаванне юрыд., маральных і інш. нормаў супольнага жыцця, але не лічыцца з імі і не падпарадкоўваецца ім. Тэорыю А. распрацаваў франц. сацыёлаг Э.Дзюркгайм. У працах «Аб падзеле грамадскай працы» (1893), «Самазабойства» (1897) ён адзначыў, што А. — дэзарганізацыя грамадскага жыцця, найчасцей узнікае ў грамадстве, якое знаходзіцца ў глыбокім эканам. і сац. крызісе, калі імкненні, жаданні, запатрабаванні людзей не маюць шанцаў на рэалізацыю. Гэта прыводзіць да канфліктных сутыкненняў інтарэсаў розных індывідаў і суполак, а пры значных маштабах можа выклікаць грамадскую дэзінтэграцыю. Гарманізацыя імкненняў і дзеянняў розных індывідаў і суполак — асн. перадумова фарміравання цэласнай неанамічнай асобы. Далейшае развіццё тэорыі А. атрымала ў працах амер. сацыёлагаў І.Ламбда (лічыў А. крыніцай сац. беспарадкаў, смуты і няпэўнасці), Р.Мертана (вызначыў А. як «канфлікт нормаў у сферы культуры»). Паводле ням. сацыёлага Р.Дарэндорфа, А. — такое становішча, калі існуючыя нормы права, маралі, грамадскі парадак беспакарана парушаюцца на ўсіх ступенях грамадскай іерархіі. *Я.М.Бабосаў.*

**АНА́МНЕЗ** (ад грэч. anamnēsis успамін), сукупнасць звестак аб жыцці хворага і развіцці хваробы, атрыманых апытаннем хворага або з іншых крыніц.

Суплоддзе **ананаса**.

Выкарыстоўваецца для ўстанаўлення дыягназу, прагнозу хваробы, выпрацоўкі аптымальных метадаў лячэння і прафілактыкі; адзін з асн. метадаў комплекснага абследавання, вывучэння хворага як асобы, індывідуальнасці; прасцейшы спосаб устанаўлення кантакту паміж хворым і ўрачом. Паводле А. дыягназ хваробы ўстанаўліваецца больш як у 50% выпадкаў. А. хваробы ўключае звесткі аб узнікненні хваробы і цячэнні яе да моманту даследавання, скаргі і адчуванні хворага. А. жыцця ўключае агульныя біягр. звесткі па перыядах жыцця, перанесеныя хваробы, спадчыннасць, сямейнае жыццё, умовы працы і быту, шкодныя звычкі. Асобна вылучаюць фармакалагічны, алергалагічны, экспертна-працоўны А. Пры неабходнасці збіраюць эпідэміялагічны А. Паняцце А. ўжываюць таксама ў ветэрынарыі пры дыягностыцы хвароб свойскіх жывёл. *М.Ф.Сарока.*

**АНА́МНІІ** (ад *ан...* + *амніён*), першаснаводныя ніжэйшыя пазваночныя (кругларотыя, рыбы, земнаводныя), у якіх у працэсе эмбрыягенезу не ўтвараецца зародкавая абалонка — амніён і асаблівы зародкавы орган — алантоіс. А. жывуць у водным асяроддзі на працягу ўсяго жыццёвага цыкла або на асобных яго стадыях.

**АНАНА́С** (Ananas), род шматгадовых травяністых раслін сям. брамеліевых. Каля 10 відаў. Пашыраны ў трапічнай Амерыцы. Культывуюць А. буйначубковы (A. comosus). Найбольшыя плантацыі на Гавайскіх і Філіпінскіх а-вах, у Малайзіі, Мексіцы, Бразіліі, на Кубе. На Беларусі вырошчваюць у аранжарэях і як пакаёвую расліну.

Лісце скурыстае, амаль лінейнае (даўж. да 90 см), па краях калючазубчастае, утварае прыкараневую разетку. Кветкі сабраны ў густое суквецце. Цвіце на 2—3-і год. Шышкападобнае залаціста-жоўтае суплоддзе складаецца з многіх ягад (пладоў), важыць 3—5, радзей каля 16 кг. Плады сакаўныя і духмяныя, багатыя цукрам, арган. солямі і вітамінамі, ядомыя. З лісця некаторых А. атрымліваюць валакно. Размнажаюць вегетатыўна — атожылкамі або верхавінкавымі чаранкамі.

**АНА́НД** Мулк Радж (н. 12.12.1905, г. Пешавар, Індыя), індыйскі пісьменнік. Скончыў Лонданскі ун-т (1929). Д-р філасофіі, праф. Пенджабскага ун-та (1962). Прэзідэнт Індыйскай акадэміі мастацтваў. Піша на англ. мове. Аўтар раманаў сац.-паліт. кірунку: «Недатыкальны» (1935), «Кулі» (1936), «Два лісткі і бутон» (1937), гіст. трылогіі «Вёска» (1939), «За чорнымі водамі» (1940), «Меч і серп» (1942. У раманах «Асабістае жыццё індыйскага раджы» (1953), «Споведзь закаханага» (1976), «Пузыр» (1984) рысы экзістэнцыялізму і фрэйдызму. Аўтар мастацтвазнаўчых прац, філас. трактатаў.

*Тв.*: Рус. пер. — Избранное. М., 1987.

*Літ.*: Калинникова Е.Я. Мулк Радж Ананд. М., 1986. *С.Н.Чубакоў.*

**АНАНІ́ЗМ**, тое, што *мастурбацыя*.

**АНАНІ́М** (ад грэч. anōnymos безыменны), 1) аўтар пісьма, запіскі або літ. твора, які ўтойвае сваё імя. 2) Літаратурны твор без подпісу, невядома кім напісаны, гл. *Ананімны твор*.

**АНАНІ́МНЫ ТВОР** у літаратуры, друкаваны або рукапісны твор без пазначэння імя аўтара або падпісаны псеўданімам. Найчасцей прычынай ананімнасці было жаданне пазбегнуць ганенняў з боку ўлад. Ананімна з'явіліся многія літ. і філас. творы: «Думкі» Б.Паскаля, «Максімы» Ф.Ларошфуко, творы Вальтэра, «Падарожжа з Пецярбурга ў Маскву» А.Радзішчава, «Гаўрыліяда» А.Пушкіна і

інш. У стараж. бел. л-ры многія творы (асабліва свецкія) былі ананімныя. У перыяд станаўлення новай бел. л-ры, якая ствараласа непрафесійнымі пісьменнікамі, яе аўтары не імкнуліся занатаваць сваё аўтарства, тым болей што гэтыя творы звычайна распаўсюджваліся вусна або ў рукапісах. Па меры росту нац.-культ. свядомасці абуджалася і цікавасць да пытання аўтарства бел. твораў (Я.Баршчэўскі, Я.Чачот, В.Дунін-Марцінкевіч і інш.). З сярэдзіны 19 ст. бел. л-ра мела пераважна апазіцыйны да самаўладства характар, большасць яе твораў прасякнута вострай крытыкай дзярж. ладу, таму іх забаранялася друкаваць аж да 1906. Але і пазней найб. вострыя творы з'яўляліся ананімна. Паводле жанру А.т. разнастайныя: паэмы («Энеіда навыварат», «Тарас на Парнасе»), лірычныя вершы («Вясна гола перапала», «Ой, у полі вецер вые»), вершаваныя або празаічныя гутаркі («Гутарка Данілы са Сцяпанам», «Гутарка старога дзеда»). Некаторыя А.т. мелі форму адозваў або паліт. пракламацый (у свой час так выдаваліся асобныя творы К.Каганца, Цёткі і інш.). Востракрытычныя А.т. бытавалі і ў сав. час («Сказ пра Лысую гару»).

*М.А.Лазарук.*

**АНА́НІЯ**, беларускі разьбяр па дрэве 2-й пал. 15 — 1-й пал. 16 ст. Стварыў для пінскага князя Фёдара Яраславіча двухбаковы разны абраз «Премудрость созда себе храм. Праздники» на тэму прытчаў Саламонавых (зберагаецца ў Рус. музеі ў С.-Пецярбургу).

*Літ.*: Плешанова И.И. Два резных деревянных образка в собрании Русского музея // Памятники культуры: Новые открытия: Ежегодник, 1979. Л., 1980.

**АНАНІЯШВІ́ЛІ** Ніна (Ніно) Гедэванаўна (н. 28.3.1963, Тбілісі), расійская артыстка балета. Нар. арт. Расіі (1995). Пасля сканчэння Маскоўскага харэагр. вучылішча (1981) салістка Вял. т-ра Расіі. Сярод партый: Маша, Аўрора («Шчаўкунок», «Спячая прыгажуня» П.Чайкоўскага), Кітры («Дон Кіхот» Л.Мінкуса), Джульета («Рамэо і Джульета» С.Пракоф'ева), Жызэль, Мірта («Жызэль» А.Адана). Лаўрэат Міжнар. конкурсаў артыстаў балета ў Варне (Балгарыя, 1981), Маскве (1985, 1986), у г. Джэксан (ЗША, 1986).

**АНА́НКЕ**, Ананка, у грэчаскай міфалогіі бажаство неабходнасці, непазбежнасці; маці *мойраў* — багіня лёсу чалавека. Грэкі лічылі, што верацяно, якое круціць паміж кален А., з'яўляецца воссю сусвету.

**АНА́НКЕ**, спадарожнік планеты *Юпітэр*. Дыяметр каля 20 км, адлегласць ад Юпітэра 20,7 млн. км. Перыяд абарачэння 617 сут. Адкрыў С.Нікалсан (1951; ЗША).

**АНА́НЧЫЦЫ**, вёска ў Беларусі, у Даманавіцкім с/с Салігорскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса. За 45 км на Пд ад горада і чыг. ст. Салігорск, 180 км ад Мінска. 712 ж., 240 двароў (1995). Сярэдняя школа, б-ка, Дом культуры, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі.

**АНА́НЬЕЎ** Анатоль Андрэевіч (н. 18.7.1925, г. Джамбул, Казахстан), рускі пісьменнік. Герой Сац. Працы (1984). Скончыў Казахскі ун-т (1957). Гал. рэдактар час. «Октябрь» (з 1973). У 1958 апубл. кніга гіст.-рэв. прозы «Верненскія апавяданні». У аповесці «Малы заслон» (1959; аб ваеннай аперацыі ў раёне Мазыр—Калінкавічы ў 1944) і рамане «Танкі ідуць ромбам» (1963; пра бітву на Курскай дузе, удзельнікам якой быў А.) раскрыта сіла духу сав. воінаў у Вял. Айч. вайну. Філас., маральныя і сац. пытанні сучаснага грамадства ўзнімае ў раманах «Мяжа» (1970), «Вёрсты

Ананія. «Премудрость созда себе храм. Праздники». Абраз. Канец 15 — пач. 16 ст.

кахання» (1972), «Гады без вайны» (кн. 1—4, 1975—85), «Скрыжалі і званы» (кн. 1, 1990).

*Тв.*: Собр. соч. Т. 1—4. М., 1984—85.

*Літ.*: Коваленко Р.М. Анатолий Ананьев. М., 1985.

**АНА́НЬЕЎ** Анатоль Андрэевіч (1900—25.5.1942), дзярж. і парт. дзеяч БССР. У 1918—33 у Чырв. Арміі, удзельнік грамадз. вайны. У 1934 на Паўн. Каўказе. З 1935 1-ы сакратар Мазырскага акр. к-та КП(б)Б. У 1937—38 нам. старшыні СНК БССР, 2-і сакратар ЦК КП(б)Б. Чл. ЦК (1936—38) і Бюро ЦК КП(б)Б (1937—38). Чл. ЦВК БССР (1935—38). У 1940 рэпрэсіраваны, асуджаны на 20 гадоў зняволення. Рэабілітаваны ў 1954.

**АНА́НЬЕЎ** Барыс Герасімавіч (14.8.1907, Уладзікаўказ — 18.5.1972), рускі псіхолаг, правадзейны чл. АПН СССР (1968). Скончыў Горскі пед. ін-т (1928, г. Арджанікідзе). З 1967 дэкан ф-та псіхалогіі Ленінградскага ун-та. Даследаванні па агульнай тэорыі і гісторыі псіхалогіі, праблемах адчуванняў, узроставай і дыферэнцыраванай псіхалогіі: «Псіхалогія педагагічнай ацэнкі» (1935), «Нарысы псіхалогіі» (1945), «Нарысы гісторыі рускай псіхалогіі XVIII і XIX стст.» (1947), «Прасторавае адрозненне» (1955), «Псіхалогія пачуццёвага пазнання» (1960), «Тэорыя адчуванняў» (1961). У працы «Чалавек як прадмет пазнання» (1968) выступіў з ідэяй стварэння адзінай канцэпцыі чалавекаказнаўства як комплекснай дысцыпліны, што сінтэзуе шырокае кола навук пра чалавека.

**АНА́НЫНСКАЯ КУЛЬТУ́РА**, археалагічная культура плямёнаў, якія ў 8—3 ст. да н.э. жылі ў басейнах рэк Кама, Сярэдняя Волга, Вятка, Белая. Назва ад могільніка каля в. Ананьіна (Татарыя). Насельніцтва займалася земляробствам і жывёлагадоўляй, жыло на селішчах і гарадзішчах у наземных драўляных жытлах памерам 10 х 5, 12 х 4 м, а таксама ў доўгіх дамах, падзеленых на секцыі. Пахавальны абрад — трупапалажэнне ў ямах, над якімі ставіліся драўляныя зрубы; у магілы клалі жал. і бронзавыя коп'і, сякеры-кельты, чаканы, кінжалы, упрыгожанні. Для А.к. характэрна кругладонная кераміка з ямкавым і шнуравым арнаментам.

**АНА́ПА**, горад у Расіі, у Краснадарскім краі. 50,3 тыс. ж. (1994). Порт на Чорным м. Чыг. станцыя. Прыморскі кліматычны і бальнеагразевы курорт. Як курорт развіваецца з 19 ст. Славуты паласой дробназярністага пясчанага пляжа даўж. каля 6 км з прылеглым мелкаводдзем, вельмі прыдатным для адпачынку і лячэння дзяцей. Клімат міжземнаморскі, з найб. працяглым на чарнаморскім узбярэжжы перыядам сонечнага ззяння. Марскія брызы, купанні з сярэдзіны мая да сярэдзіны кастрычніка. Выдатныя ўмовы для аэра-, гелія- і таласатэрапіі. Ліманныя, азёрныя і сопкавыя гразі на лячэнне органаў стрававання, гінекалагічных і нерв. хвароб. Радовішчы мінеральных, сталовых і лекавых водаў. Мноства пансіянатаў, дзіцячыя санаторыі, летнія і санаторныя лагеры, дамы адпачынку, турбазы. Археал. музей-запаведнік.

*Літ.*: Аванесов В.Н., Погосов Ю.А. Анапа. Краснодар, 1973.

**А́НА ПЕРЭ́НА**, у рымскай міфалогіі багіня надыходзячага новага года. Святкаванне ў гонар А.П. прыпадала на 15 сак., дзярж. і прыватныя асобы прыносілі ёй ахвяраванні, баляванне праходзіла ў свяшчэнным гаі на Тыбры.

**АНА́ПЕСТ** (грэч.anapaistos літар. адлюстраваны назад; адваротны *дактылю*), 1) у антычным вершаскладанні стапа з 3 складоў — 2 кароткіх і 1 доўгага (⏑⏑–). 2) У сілаба-танічным

вершаскладанні 3-складовая стапа з рытмічным націскам на трэцім складзе (- - ´-): «Пацяклі, паплылі за гада́мі гады... // На гусля́равым на́спе жыро́вым...» (Я.Купала. «Курган»). У рус. паэзіі А. упершыню ўжыў А.Сумарокаў у «Одзе супраць зладзеяў». У бел. паэзіі ўзнік у канцы 19 ст. разам з развіццём новых формаў верша.

**АНАПЛАЗМО́З**, інвазійная трансмісіўная хвароба буйной і дробнай рагатай жывёлы, якая выклікаецца паразітаваннем у крыві *анаплазмаў*. Пераносчыкі — іксодавыя кляшчы і крывасосныя насякомыя. Адзначаецца ўсюды, часцей у вяснова-восеньскі перыяд. Характарызуецца гарачкай пераменнага тыпу, прагрэсіўнай анеміяй, павелічэннем паверхневых лімфавузлоў, ацёкамі, атаніяй страўнікава-кішачнага тракту. Смяротнасць невялікая. Лячэнне тэрапеўтычнае. У мэтах прафілактыкі жывёл у летні час апрацоўваюць акарыцыднымі сродкамі.

**АНАПЛА́ЗМЫ** (Anaplasma), род паразітычных мікраарганізмаў сям. анаплазмавых. Блізкія да *рыкетсій*. Аблігатныя ўнутрыклетачныя паразіты эрытрацытаў крыві жывёл. Выклікаюць *анаплазмоз*. У эрытрацытах буйн. раг. жывёлы паразітуе A. marginale, A. centrale, у авечак і коз — A. ovis.

Форма цела круглаватая, радзей вуглаватая або выцягнутая, велічыня 0,1—1,25 мкм. Сапраўднага ядра і арганел у А. няма. Размнажаюцца простым дзяленнем. У эрытрацытах трапляюцца па 1—2, радзей 3—4 паразіты, зрэдку больш; пашкоджваецца да 50—80% эрытрацытаў.

**АНАПЛАЦЭФАЛІДО́ЗЫ КО́НЕЙ**, гельмінтозныя хваробы, якія выклікаюцца ўзбуджальнікамі — стужачнымі чарвямі (цэстоды сям. Anoplocephalidae). Прамежкавыя гаспадары — *панцырныя кляшчы*. Жывёлы заражаюцца ў асноўным летам і восенню на пашы пры заглынанні з травой інвазійных кляшчоў. Хваробы характарызуюцца прыступамі колікаў, нерв. прыпадкамі, сутаргамі, паносамі, схуднеццем, разрывам страўніка і перытанітам. Лячэнне тэрапеўтычнае. Праводзяць прафілактычныя дэгельмінтызацыі.

**АНА́Р** (сапр. Р з а е ў Анар Расул аглы; н. 14.3.1938, Баку), азербайджанскі пісьменнік. Скончыў Азербайджанскі ун-т (1960). Першыя зб-кі апавяданняў «У чаканні свята» (1963), «Дождж скончыўся» (1968). Аўтар аповесці «Белы ліман» (1970), зб. апавяданняў і аповесцяў «Мала Насрэдзін—66» (1970), «Цэйтнот» (1989), сцэнарыяў мастацкіх фільмаў, нарысаў. Выкрываў раўнадушша, жорсткасць, эгаізм. Аповесці «Круг», «Юбілей Дантэ» (зб. «Круг», 1973) прысвечаны лёсу творчай інтэлігенцыі.

**АНАРГАЗМІ́Я** (ад *ан...* + *аргазм*), адсутнасць *аргазму* пры палавых зносінах; адна з формаў зніжэння сексуальнасці ў жанчын. А. часта спалучаецца са зніжэннем палавой цягі або з поўнай яе адсутнасцю. Частата ўзнікнення залежыць ад узросту жанчыны і рэгулярнага палавога жыцця. Адрозніваюць А. першасную (з пачатку палавога жыцця) і другасную (страта аргастычных адчуванняў пасля пэўнага перыяду нармальных сексуальных адносін). У аснове А. ляжаць парушэнні псіхасексуальнага развіцця, некаторыя асаблівасці асобы, псіхагенныя фактары, захворванні. А. можа выклікаць адчуванне павышанага крованапаўнення палавых органаў, боль, эмацыянальныя парушэнні, расстройства сну. Лячэнне строга індывідуальнае, праводзіцца сексапатолагам.

**АНАРТАЗІ́Т** (ад франц. anorthose плагіяклаз), л а б р а д а р ы т, а л і г а к л а з і т, п л а г і я к л а з і т, горная парода групы *габра*. Складаецца з асн. або сярэдняга плагіяклазу з невял. колькасцю (5—10%) каляровых мінера-

Анартыт.

лаў (алівіну, піраксену, тытанамагнетыту і інш.). Колер ад белага да цёмнашэрага, амаль чорнага. Для некаторых А. характэрна ірызацыя (вясёлкавасць) у сініх і блакітных тонах. Шчыльн. 2700—3000 кг/м$^3$. А. лічаць магматычнымі пародамі. Сустракаюцца ва ўсіх абласцях выхадаў на дзённую паверхню стараж. горных парод. Выкарыстоўваюць як буд. і абліцовачны камень, на выраб помнікаў.

**АНАРТАКЛА́З** (ад *ан...* + *артаклаз*), мінерал з групы палявых шпатаў, (K, Na)[AlSi$_3$O$_8$]. Крышталізуецца ў трыклінінай сінганіі, пры награванні — у манаклінінай. Крышталі здвоеныя, таблітчастыя. Бясколерны ці белы. Шчыльн. 2,6 г/см$^3$. Трапляецца ў вулканічных пародах і гіпабісальных інтрузіўных целах; на Беларусі — у кіслых эфузіўных пародах дакембрыю.

**АНАРТЫ́Т** (ад грэч. anorthos косы), мінерал групы *палявых шпатаў*, Ca[Al$_2$Si$_2$O$_8$], крайні член ізаморфнага рада *плагіяклазаў*. Крышталізуецца ў трыклінінай сінганіі. Крышталі сустракаюцца рэдка; звычайна зерні і зярністыя агрэгаты. Колер белы, шэры, зеленаваты. Празрысты да паўпразрыстага. Бляск шкляны да перламутравага. Цв. 6—6,5; кроккі. Шчыльн. каля 2,8 г/см$^3$. Пераважна магматычнага паходжання. А. — пародаўтваральны мінерал горных парод асн. саставу (габра, базальты і інш.), якія трапляюцца на Беларусі ў адкладах дакембрыю. Знойдзены ў некаторых метэарытах. Выкарыстоўваецца ў керамічнай прам-сці.

**АНА́РХА-СІНДЫКАЛІ́ЗМ**, плынь у рабочым руху, сфарміраваная пад уплывам *анархізму*. Узнік у канцы 19 ст. ў Францыі, Італіі, Іспаніі, Швейцарыі, краінах Лац. Амерыкі. Найб. росквіту дасягнуў на пач. 20 ст. Яго прыхільнікі адмаўляюць паліт. арг-цыю рабочых; вышэйшай формай арг-цыі лічаць рабочыя сіндыкаты (прафсаюзы), якія падрыхтуюць і ажыццявяць сац. пераварот, і тады будуць ліквідаваны паліт. ўлада і дзяржава. У выніку асн. сродкі вытв-сці, кіраванне вытв-сцю і размеркаванне пяройдуць да Федэрацыі сіндыкатаў, якая павінна стаць на чале новага грамадства. А.-с. і зараз робіць уплыў на частку рабочых і дробнай буржуазіі. Сучасныя яго прыхільнікі канцэнтруюць увагу на праблемах свабоды асобы і насіллі як адзінай форме барацьбы за пераход да свабоднага грамадства. Ідэі А.-с. выкарыстоўваюць розныя леваэкстрэмісцкія плыні.

*М.В.Навучыцель.*

**АНАРХІ́ЗМ** (ад грэч. anarchia безуладдзе), ідэалогія, грамадска-паліт. плынь у рэв. руху, мэта якой — вызваленне асобы ад паліт., эканам. і духоўнай улады. У тэарэт. адносінах не мае адзінай, лагічна паслядоўнай канцэпцыі. Асобныя ідэі А. існавалі яшчэ ў антычнай філасофіі (Платон, стоікі), атрымалі развіццё ў ідэалогіі гусізму, творах франц. асветнікаў і асабліва грамадска-паліт. дзеячаў 19 ст.: М.*Штырнера*, П.*Прудона*, М.*Бакуніна*, П.Крапоткіна і інш. Сац.-філас. аснова А. — *індывідуалізм, суб'ектывізм* і *валюнтарызм*. А. негатыўна ставіцца да дзяржавы як сац. ін-та, замяняе дзяржаву абшчынай, у якой рэалізуецца свабода асобы. Як грамадска-паліт. плынь аформіўся ў 1840—70-я г. ў Зах. Еўропе. У Расіі ідэі А. ўспрынялі народнікі (гл. *Народніцтва*). У пач. 20 ст. А. атрымаў новае развіццё. У 1903—05 на Беларусі групоўкі анархістаў існавалі ў Баранавічах, Брэсце, Гродне і інш., у 1917—20 — у Віцебску, Гомелі, Мінску. Іх дзейнасці ўласцівы рэв. нецярпімасць, авантурызм, хістанні ад супрацоўніцтва з Саветамі да антысав. выступленняў. Пасля 2-й сусв. вайны А. выступае пераважна ў форме неаанархізму (*анархасіндыкалізм*, анарха-калектывізм, анарха-камунізм, трацкізм, мааізм і г.д.). Дзейнасць анархістаў праявілася ў гады грамадзянскай вайны (гл. *Махно*). Ідэі А. ўплываюць на погляды «новых левых», «зялёных», «левых радыкалаў», прыхільнікаў альтэрнатыўных рухаў і інш.

*Т.І.Адула.*

**АНА́РХІЯ ВЫТВО́РЧАСЦІ**, стыхійнасць, хаатычнасць, бяспланавасць грамадскай вытв-сці; паводле марксісцкай тэорыі, характэрная асаблівасць капіталізму. Мела месца ў эпоху дамана-паліст. капіталізму, калі дробныя прадпрымальнікі вялі паміж сабой жорсткую канкурэнтную барацьбу, а ў вытворча-гасп. дзейнасці ўлічвалі найперш стыхійны попыт і рыначныя цэны на тавары. У перыяд дзярж.-манапаліст. капіталізму ў развітых краінах пачалося вывучэнне попыту і прапановы, укараненне *маркетынгу*, дзярж. рэгуляванне эканомікі. У некат. развітых краінах дзейнічаюць дзярж. планавыя камітэты, а для абмежавання самавольства манаполій у іх канкурэнтнай барацьбе створана антыманапольнае заканадаўства.

**АНАСА́ЗІ**, археал. культура амерыканскіх індзейцаў, якія з 1—2 ст. н.э. жывуць на сумежжы штатаў Арызона, Юта, Нью-Мексіка і Каларада (ЗША). Назва ад імя стараж. народа, продкаў сучаснага народа пуэбла. У час росквіту (перыяд класічнага Пуэбла, 1050—1300) А. займаліся земляробствам (асн. культура кукуруза), выраблялі характэрную паліхромную кераміку, будавалі т.зв. пуэбла (вял. колькасць прамавугольных жытлаў, якія цесна прыціснуты адно да аднаго і ўтвараюць некалькі паверхаў ці тэрас) і ківа (падземныя камеры ў пуэбла, выкарыстоўваліся як мужчынскія дамы і памяшканні для рэлігійных цырымоній). Іх найбольшыя гарады Пуэбла-Баніта, Меса-Вердэ і інш. З 1300 пачаўся перыяд заняпаду, які працягваўся да заваявання іх іспанцамі (канец 17 ст.). Некат. пуэбла заселеныя і цяпер.

**АНАСТАМО́З** (ад грэч. anastomōsis адтуліна, выхад) у ж ы в ё л — злучэнне паміж двума крывяноснымі або лімфатычнымі сасудамі або двума нервамі. У клініцы ч а л а в е к а А. наз. штучнае або патагеннае злучэнне паміж трубчастымі органамі. У в ы ш э й ш ы х р а с л і н — злучэнне паміж трубчастымі структурамі, напр. паміж жылкамі ў ліста, разгалінаваннямі млечнікаў і інш. У г р ы б о ў — злучэнне або зрастанне двух гіфаў міцэлію.

**АНАСТАСЕ́ВІЧ** Васіль Рыгоравіч (11.3.1775, Кіеў — 28.2.1845), бібліёграф, перакладчык, выдавец. Скончыў Кіеўскую акадэмію (1793). З 1795 на вайск. службе, з 1802 у Мін-ве нар. асветы, у 1803—10 пісьмавод папячыцеля Віленскай навуч. акругі А. Чартарыйскага, у 1809—16 у Камісіі складання законаў, у 1826—28 у Гал. цэнзурным камітэце. У 1811—12 выдаваў час. «Улей», дзе надрукаваў першы ў Расіі тэарэт. артыкул па бібліяграфіі. З 1817 адзін з сакратароў М.П.Румянцава, уваходзіў у *Румянцаўскі гурток*. У 1811 ажыццявіў навук. выданне Статута ВКЛ 1588. Пераклаў з польск. мовы на рускую палітэканамічныя працы В. і І.Страйноўскіх. *Дз.У.Караў.*

**АНАСТЫГМА́Т** (ад *ан...* + *астыгматызм*), складаны *аб'ектыў*, які практычна пазбаўлены ўсіх аберацый (гл. *Аберацыі аптычных сістэм*). Пры вял. святласіле выразны відарыс па ўсім полі. Складаецца са спец. падабраных лінзаў. Выкарыстоўваецца ў тэхн. і маст. фатаграфіі і кінематаграфіі.

**АНАТА́З**, мінерал падкласа простых вокіслаў, адна з трох паліморфных мадыфікацый *рутылу* ($TiO_2$); прымесі жалеза, цынку, ніобію. Крышталізуецца ў тэтраганальнай сінганіі. Крышталі таблітчастыя, прызматычныя і інш. Колер ' зеленавата-жоўты, буры, чорны. Бляск алмазны. Цв. 5—6. Шчыльн. 3,9 г/см$^3$. Пры награванні да 620—650 °С пераходзіць у рутыл. Другасны *акцэсорны мінерал*: адзінкавыя зерні ў пегматытах, сланцах, у россыпах, баксітах і інш.

**АНАТАКСІ́НЫ** (ад *ана...* + *таксіны*), бактэрыяльныя таксіны, якія ў выніку спец. апрацоўкі (напр., фармалінам, цяплом) страцілі ядавітыя ўласцівасці, але захавалі здольнасць стымуляваць імунітэт. Выкарыстоўваюць для прафілактыкі і лячэння дыфтэрыі, слупняку і інш. інфекцый.

**АНАТАЛІ́ЙСКАЕ АГЕ́НЦТВА** (Anadolu Ajansi; AA), інфармацыйнае агенцтва ў Турцыі. Засн. ў г. Анкара ў 1920. Т-ва акцыянернае, большасць акцый належыць ураду. Мае сувязі з найбуйнейшымі агенцтвамі свету, шырокую карэспандэнцкую сетку ў краіне і за яе межамі. Выпускае штодзённы бюлетэнь у Анкары і Стамбуле.

**АНАТАЛІ́ЙСКАЕ ПЛАСКАГО́Р'Е**, унутраная ч. *Малаазіяцкага нагор'я*, у Турцыі. Даўж. каля 700 км (з З на У), шыр. 400 км (з Пн на Пд). На Пн абмежавана Пантыйскімі гарамі, на Пд — гарамі Таўр. Паверхня выраўнаваная, слаба расчлянёная, пераважныя выш. 800—1500 м, найб. — 3916 м (вулкан Эрджыяс). Складзена ў асн. з асадкавых парод, адзначаны праяўленні вулканізму. Радовішчы бурага вугалю. Клімат субтрапічны, кантынентальны. Ападкаў ад 200 да 500 мм за год, максімальныя — вясной. А.п. перасякаюць рэкі Кызыл Ірмак, Сакар'я і інш. Ёсць саланчакі і салёныя азёры (воз. Туз і інш.). Глебы шэрыя і бурыя. Расліннасць — сухі палынова-злакавы стэп (у гарах) і паўпустыні з зараснікамі калючых падушкападобных хмызнякоў. Аазіснае земляробства, жывёлагадоўля.

**АНАТАЛІ́ЙСКІ БУРАВУ́ГАЛЬНЫ БАСЕ́ЙН**, у Зах. і Цэнтр. Анатоліі ў Турцыі. Геал. запасы 3,8 млрд. т (1978). Больш за 40 радовішчаў. Вугляноснасць басейна вядома са старажытнасці, інтэнсіўнае прамысл. асваенне з 2-й пал. 20 ст. Магутнасць пластоў вугалю ад 0,6—2,5 м да 80 м. Цеплыня згарання 11,73—19,56 МДж/кг. Каля 85% вугалю здабываецца адкрытым спосабам.

**АНАТА́ЦЫЯ** (ад лац. annotatio заўвага), сціслая характарыстыка кнігі, артыкула, рукапісу і інш.

**АНАТО́ЛІЯ** (грэч. Anatolē, тур. Anadolu), у старажытнасці назва М. Азіі. Уваходзіла ў склад Хецкай дзяржавы, з 4 ст. да н.э. — у імперыю Аляксандра Македонскага, з 2 ст. да н.э. ў Рым. імперыі, потым да 11 ст. ў Візантыі, у 11—14 ст. у дзяржаве сельджукаў. У 14—15 ст. заваявана туркамі-асманамі. У Асманскай імперыі А. — правінцыя на З М. Азіі з цэнтрам у г. Кютах'я. З 1920-х г. А. называецца ўся азіяцкая частка Турцыі.

**АНАТО́МІЯ** (ад грэч. anatomē рассячэнне, расчляненне), навука пра форму і будову асобных органаў, сістэм і арганізма ў цэлым; раздзел *марфалогіі*. Адрозніваюць А. чалавека (антрапатомію), А. жывёл (заатомію) і *анатомію раслін* (фітатомію). Самастойнай з'яўляецца *параўнальная анатомія жывёл*. Разам з фізіялогіяй А. складае аснову тэарэт. і практычнай медыцыны і ветэрынарыі.

У сваім развіцці А. ч а л а в е к а і ж ы в ё л як навука прайшла шэраг этапаў. Першапачатковы, апісальны, этап узнік пры выкарыстанні метаду расчлянення, калі збіраліся і апісваліся факты пра будову цела чалавека і жывёл. Заснавальнік яе — фламандзец А.Везалій (16 ст.). Апісальную А. падзяляюць на сістэматычную (вывучае органы па сістэмах), тапаграфічную (разглядае будову і форму органаў і іх узаемаразмяшчэнне) і пластычную (даследуе статыку і дынаміку вонкавых формаў цела). Новы этап у развіцці А. — функцыянальны — тлумачэнне назапашаных фактаў з пункту гледжання *антагенезу* і *філагенезу* і функцыянальнага назначэння органаў і сістэм. Сучасны этап — эксперыментальны — аналіз структурна-функцыянальнай арганізацыі органаў і сістэм у сувязі з рознымі фактарамі навакольнага асяроддзя. Вылучаюць таксама А. дынамічную, узроставую, мікраскапічную (*гісталогія* і *цыталогія*) рэнтгенаанатомію і інш. Заснавальнікі А.: Арыстоцель, К.Гален, Везалій, Леанарда да Вінчы, У.Гарвей і інш. У Расіі найб. значныя даследаванні ў 18—19 ст. па пытаннях будовы і функцыі страўніка (А.П.Пратасаў), будовы нырак (А.М.Шумлянскі), стварэнні тапаграфічнай А. (М.І.Пірагоў), рус. анат. тэрміналогіі (М.І.Шэін). У 19 ст. засн. першая рус. анат. школа (П.А.Загорскі, 1807), складзены анатамічны слоўнік (Н.М.Амбодзік-Максімовіч). Прагрэсу анат. навукі спрыялі таксама працы П.С.Лесгафта, Дз.М.Зёрнава, У.А.Беца, В.П.Вараб'ёва, У.М.Танкова, Дз.А.Жданава, Б.М.Долга-Сабурава і інш.

На Беларусі 1-е анатаміраванне цела праведзена ў 1586 у Гродне для ўдакладнення прычыны смерці караля Стафана Баторыя. Станаўленне сучаснай анат. навукі звязана з арганізацыяй у 1921 кафедры анатоміі на мед. ф-це БДУ. Заснавальнік — С.І.Лябёдкін, які стварыў нац. школу марфолагаў. Н.-д. работа вядзецца на кафедрах анатоміі Віцебскага, Гомельскага, Гродзенскага, Мінскага мед. ін-таў, Бел. акадэміі фізічнай культуры і спор-

ту, у Віцебскай акадэміі вет. медыцыны, БДУ і інш. Значную ролю ў развіцці А. адыгралі працы Д.М.Голуба па праблемах эмбрыятэнезу чалавека і жывёл, вывучэнні структурнай арганізацыі вегетатыўнай нерв. сістэмы, нерв. шляхоў і дапаўняльных цэнтраў інервацыі. Высветлена анатомія сімпатычнага ствала, нерваў наднырачнікаў, крывяносных сасудаў і інш. органаў (А.С.Леанцюк, А.П.Амвросьеў, П.І.Лабко і інш.). Даследуюцца будова лімфатычных сасудаў касцей і суставаў (У.І.Ашкадзёраў), касцявы і перапончаты лабірынты чалавека і жывёл (З.І.Ібрагімава), узроставыя асаблівасці галаўнога мозга чалавека і яго артэрыяльных сасудаў (А.М.Габузаў). Існуе навук. т-ва анатамаў, гістолагаў і эмбрыёлагаў.

*Літ.*: Анатомия человека. Т. 1—2. 2 изд. М., 1993; Акаевский А.И. Анатомия домашних животных. 3 изд. М., 1975.

*П.І.Лабко.*

**АНАТО́МІЯ РАСЛІ́Н**, раздзел батанікі, які вывучае ўнутр. будову органаў і тканак раслін.

Узнікненне і развіццё А.р. звязана з вынаходствам мікраскопа і працамі італьян. біёлага М.Мальпігі і англ. батаніка Н.Гру (мікраскапічнае вывучэнне раслінных аб'ектаў; 2-я пал. 17 ст.), стварэннем клетачнай тэорыі (ням. біёлаг Т.Шван, 1839), даследаваннем раслінных тканак, клетак і іх арганоідаў (2-я пал. 19 — пач. 20 ст.) паралельна з вывучэннем іх росту, развіцця і дыферэнцыроўкі ў працэсе антагенезу (гл. *Фізіялогія раслін*). Значную ролю ў развіцці А.р. адыгралі працы рус. батанікаў І.В.Баранецкага, С.П.Костычава, В.Р.Заленскага, В.Ф.Раздорскага, В.Р.Аляксандрава, В.М.Радкевіч, А.А.Яцэнка-Хмялеўскага, В.К.Васілеўскай, М.Ф.Данілавай і інш.

На Беларусі А.р. развіваецца з 1930-х г. (К.Г.Рэнард, А.Л.Новікаў, С.У.Калішэвіч). Навук.-даследчая работа вядзецца ў БДУ, ін-тах біял. аддзялення АН Беларусі, Бел. с.-г. акадэміі, Гомельскім і Бел. тэхнал. ун-тах і інш. У 1954—66 выкананы работы па экалагічнай, параўнальнай і тэхн. А.р. (В.Я.Віхроў, Р.Ц.Пратасевіч, А.С.Самцоў). Вывучаецца зменлівасць анат. будовы дзікарослых і культурных раслін пад уплывам генет. і фізіял. фактараў, а таксама дрэвавых раслін пад уплывам экалагічных умоў, вырашаюцца пытанні палягання с.-г. культур (Н.С.Суднік, А.В.Пятрэнка, Пратасевіч, Т.Ф.Дзяругіна, Г.А.Новікава, А.Р.Тэн, А.І.Аляксеева, Н.С.Кісялёва і інш.). Даныя А.р. выкарыстоўваюць у аграноміі, тэхніцы, гісторыі культуры, археалогіі, прам-сці (харч., мэблевай, фармацэўтычнай, цэлюлозна-папяровай і інш.). Істотнае развіццё атрымліваюць эвалюцыйны і экалагічны кірункі вывучэння А.р.

*Літ.*: Киселева Н.С. Анатомия и морфология растений. 2 изд. Мн., 1976; Эзау К. Анатомия семенных растений: Пер. с англ. Кн. 1—2. М., 1980.

**АНА́ЎСКАЯ КУЛЬТУ́РА**, археалагічная культура плямёнаў энеаліту (пач. 5-га — пач. 3-га тыс. да н.э.) на тэр. паўд. Туркменістана. Назва ад паселішчаў каля аула Анаў (каля Ашгабада). Насельніцтва займалася земляробствам і жывёлагадоўляй, жыло ў дамах з гліняных блокаў ці сырцовай цэглы. Нябожчыкаў хавалі ў ямах у скурчаным стане; у магілы клалі посуд, прылады працы, зброю з каменю і медзі, упрыгожанні. Посуд А. пласкадонны, размаляваны фарбаю (геаметрычны арнамент), характэрны тэракотавыя жаночыя статуэткі. Найб. вядомы помнік А.к. — *Намазга-Тэпэ*.

**АНАФА́ЗА** (ад *ана...* + *фаза*), фаза мітатычнага і мітатычнага дзялення клеткі. Характарызуецца разыходжаннем храмасом да процілеглых полюсаў клеткі. Гл. *Меёз, Мітоз*.

**АНА́ФАРА** (грэч. *anaphora* літар. вынясенне ўверх), адзінапачатак, *стылістычная фігура* ў вершаскладанні — паўтарэнне аднолькавых гукаспалучэнняў, слоў ці выразаў у пачатку вершаваных радкоў або суседніх строфаў (адпаведна выдзяляюць гукавую, лексічную і сінтаксічную А.). Павышае эмацыянальнасць паэт. выказвання, узвышае яго тон, кампазіцыйна арганізуе, яднае асобныя радкі і часткі тэксту. Прыклад лексічнай А.:

**Зноў** навіслі цёмны хмары,
**Зноў** туманы неба крыюць,
**Зноў** па свеце ходзяць мары,
**Зноў** крапчэй нам віхры вьюць...

(Цётка. «Бура ідзе»)

**АНА́ФЕМА** (ад грэч. *anathēma* праклятае), царкоўнае праклятае; найвышэйшая кара ў хрысціянстве, звязвалася з *адлучэннем* ад царквы асоб, якія адвяргаюць ці скажаюць асновы веравучэння і не выказваюць жадання пакаяцца ў гэтым. Устаноўлена з часу Халкідонскага ўсяленскага сабора (451). Абвяшчаецца на царк. саборах, а таксама ў храмах падчас богаслужэння (напр., у канцы 1-га тыдня Вялікага посту ў правасл. царкве).

**АНАФІЛАКСІ́Я** (ад *ана...* + грэч. *phylaxis* ахова), від алергічнай рэакцыі неадкладнага тыпу, якая развіваецца адразу пры паўторным парэнтэральным (не праз страўнікава-кішачны тракт) пападанні ў арганізм некаторых *алергенаў*. Найб. выразнае агульнае праяўленне — анафілактычны *шок*, мясцовыя — запаленне, ацёк, часам некроз тканкі. А. можа быць і пры ўжыванні некаторых лек. прэпаратаў, укусах пчол, восаў, чмялёў, ад раслінага пылку. Гл. таксама *Алергічныя хваробы, Алергія*.

**А́НАХАЙМ** (Anaheim), горад на ПдЗ ЗША, штат Каліфорнія. Засн. ў 1858 ням. перасяленцамі. 266,4 тыс. ж. (1994); з г. Санта-Ана і прыгарадамі больш за 2 млн. Трансп. вузел. Радыёэлектронная, хім., харч. прам-сць. Кліматычны курорт на беразе Ціхага акіяна. Вядомы цэнтр «Дыснейленд».

**АНАХРАНІ́ЗМ** (ад *ана...* + грэч. *chronos* час), 1) парушэнне храналагічнай дакладнасці, якое прыводзіць да неапраўданага ўнясення ў апісанне якой-н. эпохі рыс, характэрных для інш. часу. 2) З'явы, погляды, думкі, устарэлыя для пэўнай эпохі. 3) Перажытак мінулага.

**АНАЦЭ́ВІЧ** Ігнат Сымонавіч (псеўд. Жэгота з Малой Бераставіцы; 1780, в. Малая Бераставіца Бераставіцкага р-на Гродзенскай вобл. — 18.2.1845), гісторык, археограф, архівіст. Вучыўся ў Кёнігсбергскім ун-це (1803—05), скончыў Віленскі ун-т (1811). У 1813—17 выкладчык у Беластоцкай гімназіі, з 1818 у Віленскім ун-це, з 1827 прафесар. У 1828 абвінавачаны ва ўдзеле ў студэнцкай арг-цыі «Плямёны сарматаў» і высланы на радзіму. З 1834 у Пецярбургу, супрацоўнік Археаграфічнай камісіі, Румянцаўскага музея. Даследаваў архівы і б-кі Пецярбурга, Дэрпта, Рыгі, Кёнігсберга, Варшавы, рукапісныя зборы прыватных асоб у Гродзенскай губ. Аўтар артыкулаў па гісторыі ВКЛ, гал. праца «Гісторыя Літвы» не надрукавана. *Дз.У.Караў.*

**АНАША́**, наркатычны прэпарат, які атрымліваюць з зялёных частак індыйскіх канапель (Cannabis indica). Гл. таксама *Гашыш, Наркотыкі*.

**АНАЭРАБІЁЗ** (ад *ан...* + *аэра...* + *...біёз*), анаксібіёз, жыццё пры адсутнасці свабоднага малекулярнага кіслароду. Звычайная ўмова існавання *анаэробных арганізмаў*. Тэрмін А. увёў франц. вучоны Л.Пастэр (1861); ён паказаў, што мікраарганізмы, якія выклікаюць маслянакіслае браджэнне, гінуць у прысутнасці кіслароду. У шматклетачных жывёл А. — часцей часовы стан, які забяспечвае выжыванне ў перыяды недахопу кіслароду і суправаджаецца рэзкім падзеннем абмену рэчываў і пераходам у неактыўнае становішча (гл. *Анабіёз*). Працэсы анаэробнага ператварэння (браджэнне, гніенне) маюць вял. значэнне ў кругавароце рэчываў у прыродзе.

**АНАЭРО́БНЫЯ АРГАНІ́ЗМЫ**, анаэробы (ад *ан...* + *аэра...* + грэч. bios жыццё), жывёльныя і раслінныя арганізмы, здольныя існаваць і развівацца пры адсутнасці свабоднага кіслароду ў асяроддзі. Пашыраны ўсюды, дзе адбываецца распад арган. рэчываў без доступу паветра (у глебе, вадзе, донных адкладах, кампоставых кучах, у ранах, у кішэчніку чалавека і жывёл і інш.). Тэрмін увёў франц. вучоны Л.Пастэр (1861), які адкрыў бактэрыі маслянакіслага браджэння. Неабходную для жыццядзейнасці энергію А.а. ў адрозненне ад аэробаў атрымліваюць за кошт акіслення арган., радзей мінер. злучэнняў у бескіслародным асяроддзі. Падзяляюцца на аблігатныя, або строгія (жывуць пры поўнай адсутнасці кіслароду, напр., маслянакіслыя, хвароба-

творныя бактэрыі: палачкі слупняку, газавай гангрэны, некат. стрэптакокі), і факультатыўныя, або ўмоўныя, А.а. (здольныя жыць і развівацца ў прысутнасці кісларoду і без яго, напр., дражджавыя грыбкі, малочнакіслыя бактэрыі, палачкі брушнога тыфу, інфузорыі, плоскія і круглыя чэрві). Некат. А.а. выкарыстоўваюцца ў прам-сці, сельскай гаспадарцы, побыце (напр., бактэрыі спіртавога, малочнакіслага браджэння, дражджавыя грыбкі).

**АНАЭРО́БНЫЯ ІНФЕ́КЦЫІ**, цяжкія інфекцыі, якія выклікаюцца хваробатворнымі *анаэробнымі арганізмамі*. Найб. небяспечныя з іх газавая гангрэна (у дачыненні да яе тэрмін А.і. ўжываецца найчасцей), *слупняк, батулізм*.

**АНАЭРО́БЫ**, гл. *Анаэробныя арганізмы*.

**АНВЕ́Р** (Anvers), гл. *Антверпен*.

**АНГАЖЫ́РАВАНАЕ МАСТА́ЦТВА** (ад франц. engager, абавязваць), мастацтва, якое адкрыта выяўляе грамадскую пазіцыю творцы, актыўна ўдзельнічае ў паліт. барацьбе, асабліва ў час крызісных сітуацый і карэнных перамен у жыцці грамадства. Свой пачатак вядзе ад сац.-рэв. рухаў 18 ст. ў Францыі, Рэчы Паспалітай і інш. Развівалася ў 19—20 ст. у рэв., паліт., нац.-вызв., антыфаш. барацьбе. Абвостраны ідэйна-дэкларатыўны характар набыло ў СССР пасля 1917. Актыўна развівалася ў 1920—30-я г. ў тэатралізаваных паказах, прыкладной графіцы, манументальным афармленні і інш. відах і формах. З канца 1980-х г. на Беларусі перажывае новы ўздым у сувязі з паліт. і рэфарматарскімі працэсамі, нац. адраджэннем. *Я.Ф.Шунейка.*

**АНГАЖЭМЕ́НТ** (ад франц. engagement абавязацельства, наём), кантракт, заключаны з акцёрам на пэўны тэрмін і на пэўных умовах для ўдзелу ў спектаклях або канцэртах.

**АНГА́Р** (франц. hangar), закрытае збудаванне для трымання, тэхн. абслугоўвання і рамонту лятальных апаратаў. Бываюць наземныя (найчасцей), падземныя і на вадзе; стацыянарныя (на аэрадромах, будуюцца з метал. або жалезабетонных нясучых канструкцый), часовыя (звычайна драўляныя) і зборна-разборныя для палявых аэрадромаў (канструкцыі са сталі, лёгкіх сплаваў і пластмас). Аснашчаюцца пад'ёмна-трансп. абсталяваннем, сродкамі сувязі, аўтам. пажаратушэння і інш. Пралёты А. да 150 м, выш. да 40 м. Вял. А. складаюцца з некалькіх секцый.

**АНГАРА́**, рака на ПдЗ Усх. Сібіры, правы, самы мнагаводны прыток Енісея, у Іркуцкай вобл. і Краснаярскім краі Расійскай Федэрацыі. Даўж. 1779 км, пл. бас. 1040 тыс. км$^2$. Выцякае з воз. Байкал, цячэ па паўд. ч. Сярэднесібірскага пласкагор'я. Ад вытоку большая ч. ракі ператворана ў каскад вадасховішчаў. У ніжнім цячэнні ў рэчышчы парогі Мурскі, Стралкоўскі (каля вусця), шматлікія шыверы, шмат астравоў. Асн. прытокі: Іркут, Ака з Іяй, Кова, Тасеева (злева), Ілім, Чадабец (справа). Водны рэжым А. зарэгуляваны воз. Байкал і вадасховішчамі. Жыўленне (акрамя азёрнага) снегавое і дажджавое. Ледастаў на вадасховішчах з ліст., ніжэй — з канца вер. да мая. Сярэднегадавы расход вады ў вярхоўі 1730 м$^3$/с, у вусці 5100 м$^3$/с. Суднаходная ад вытоку (з перарывамі каля плацін ГЭС). На А. Іркуцкая, Брацкая, Усць-Ілімская ГЭС з вадасховішчамі, будуецца (1989) Багучанская ГЭС. Гал. гарады: Іркуцк, Ангарск, Усолье-Сібірскае, Свірск, Брацк, Усць-Ілімск.

**АНГАРМАНІ́ЧНЫЯ ВАГА́ННІ**, перыядычныя ваганні складанай (несінусаідальнай) формы. Можна вызначыць



Ангарманічнае ваганне (*а*) і раскладанне яго на складаемыя (*б* і *в*).

як суму *гарманічных ваганняў* з кратнымі частотамі. Гл. таксама *Абертон*.

**АНГА́РСК**, горад у Расіі, у Іркуцкай вобл., прыстань на р. Ангара. 262,7 тыс. ж. (1994). Чыг. станцыя. Нафтаперапр., хім. і нафтахім. прам-сць, машынабудаванне і металаапрацоўка; прадпрыемствы дрэваапр., буд. матэрыялаў прам-сці.

**АНГА́РСКІ КРАЖ**, у Расійскай Федэрацыі, на ПдУ Сярэднесібірскага пласкагор'я, пераважна ў бас. р. Ангара. Даўж. каля 800 км. Выш. да 1022 м. Складаецца з паралельных градаў з выраўнаванымі міжрэччамі. На ПнУ — лістоўнічная тайга, на ПдЗ — хваёвыя лясы з масівамі піхтава-кедравай тайгі.

**АНГАРЫ́ДА**, мацярык, які існаваў на месцы Паўн. Азіі ў 2-й палавіне палеазою і пачатку мезазою. Утварыўся ў выніку герцынскага *тэктагенезу*, што злучыў у адзіны кантынент Сібірскую і Кітайска-Карэйскую стараж. платформы і некат. зоны байкальскай і каледонскай кансалідацыі. На Пд аддзяляўся морам Тэтыс ад *Гандваны*, у выніку распаду якой да А. далучыліся Аравійская пліта і Індыйская платформа і ўтварыўся суперкантынент Еўразія.

**АНГА́РЫЯ** (грэч. angareia), 1) у Рымскай імперыі, Візантыі, дзяржавах сярэдневяковай Еўропы (імперыі Каралінгаў, Балгарыі, Польшчы і інш.) дзярж. ямская павіннасць — пастаўка ўючнай жывёлы для дзярж. перавозак. У 13—14 ст. у Візантыі і Балгарыі А. ўключала і інш. павіннасці (работа на буд-ве дарог, мастоў, крэпасцяў). 2) У Візантыі, феад. Італіі і некаторых інш. краінах Еўропы паншчына і інш. павіннасці на карысць землеўладальніка. 3) У міжнар. праве захоп дзяржавай, якая ваюе, у сваіх портах гандл. суднаў нейтральных краін для выкарыстання ў ваен. мэтах (перавозкі войскаў, узбраення і інш.).

**АНГА́РЭЦІС** (сапр. Алекса Зігмас Іонавіч; 25.6.1882, в. Абялупяй Вілкавішкскага р-на, Літва — 22.5.1940), дзеяч Кампартыі Літвы і Беларусі, гісторык. Чл. С.-д. партыі Літвы з 1906. Удзельнік рэвалюцыі 1905—07. У 1909 зняволены ў турму, у 1915 сасланы на Ангару (адсюль псеўданім). У 1917 чл. Петраградскага к-та РСДРП(б). Са снеж. 1917 нам. камісара па літоўскіх справах пры Наркамнацы. У 1919 нарком унутр. спраў Літ.-Бел. ССР, чл. Прэзідыума, у 1920 чл. Палітбюро ЦК КП(б)ЛіБ. З вер. 1920 сакратар Замежнага бюро ЦК КПЛ, з 1921 прадстаўнік КПЛ у Выканкоме Камінтэрна, з 1923 чл. Палітбюро ЦК КПЛ. У 1926—35 сакратар Інтэрнац. кантрольнай камісіі Камінтэрна. Аўтар «Гісторыі рэвалюцыйнага руху і барацьбы рабочых Літвы» (т. 1—2, 1921). Рэпрэсіраваны. Рэабілітаваны пасмяротна.

**АНГЕ́ЛІНА** Праскоўя Мікітаўна (12.1.1913, в. Старабешава Данецкай вобл. — 21.1.1959), трактарыстка, арганізатар (1933) і брыгадзір першай у СССР жаночай трактарнай брыгады. Скончыла Маскоўскую с.-г. акадэмію імя К.А.Ціміразева (1940). Двойчы Герой Сац. Працы (1947, 1958). Дэп. Вярх. Савета СССР у 1937—58. Дзярж. прэмія СССР 1946.

**А́НГЕЛЫ**, дынастыя візант. імператараў у 1185—1204. Прыйшлі да ўлады пасля звяржэння *Андраніка I Камніна*. Заснавальнік дынастыі Ісак II (правіў у 1185—95 і ў 1203—04); прадстаўнікі: Аляксей III (брат Ісака II, 1195—1203), Аляксей IV (сын Ісака II, правіў разам з ім у 1203—04). Складаныя ўнутр. і знешнія паліт. абставіны, сепаратызм правінцый, нянавісць насельніцтва Канстанцінопаля да апошніх з А., якія падтрымлівалі крыжаносцаў, прывялі да звяржэння дынастыі.

**АНГЕ́ЛЬНСКАЯ ПАРО́ДА** буйной рагатай жывёлы, тое, што *англерская парода*.

**АНГЕМІТО́НІКА** (ад *ан...* + *гемі...* + + грэч. tonos тон), гукавая сістэма, заснаваная на беспаўтонавых гукавых суадносінах. Разнавіднасці А. — 3-, 4-,

5-ступенная (пентатоніка) у аб'ёмах кварты, квінты, а таксама актавы, малой сексты, септымы. Тыповая інтанацыя — трыхорд у кварце (напр., рэ-фасоль). На ангемітоннай, у прыватнасці пентатоннай, сістэме засн. музыка многіх народаў (кітайцаў, манголаў, татараў, башкіраў, буратаў, шатландцаў і інш.). У слав. народаў А. часта спалучаецца з дыятанічнымі сістэмамі, але сустракаецца і ў чыстым выглядзе, асабліва ў песенным фальклоры стараж. пласта.

*Літ.*: Квитка К.В. Ладовые системы в музыке славян и соседних народов // Избр. гр. М., 1971. Т. 1; Елатов В.И. Ладовые основы белорусской народной музыки. Мн., 1964; Мухаринская Л.С. Белорусская народная песня. Мн., 1977. *З.Я.Мажэйка.*

**АНГІДРО́Н**, гл. ў арт. *Магнію злучэнні.*

**АНГІДРЫ́ДЫ**, хімічныя злучэнні; вытворныя арган. і неарган. кіслот, якія ўтвараюцца пры іх *дэгідратацыі*. А. неарган. кіслот — аксіды кіслотаўтваральных элементаў [напр., серны А. ($SO_3$), фосфарны ($P_2O_5$), вугальны ($CO_2$) і інш.] можна атрымліваць таксама акісленнем простых рэчываў; А. арган. кіслот [напр., воцатны А. $(CH_3CO)_2O$, малеінавы $(C_2H_2CO)_2O$] — кандэнсацыяй іх вытворных. А. гідралізуюцца да адпаведных кіслот. Выкарыстоўваюцца ў вытв-сці палімераў, фарбавальнікаў, таксама як асушальнікі, ацыліруючыя сродкі.

**АНГІДРЫ́Т** (ад *ан...* + грэч. hydōr вада), 1) мінерал класа сульфатаў $Ca(SO_4)$. Крышталізуецца ў рамбічнай сінганіі. Крышталі тоўстатаблітчастыя, прызматычныя, ігольчастыя. Зярністыя, валакністыя агрэгаты, канкрэцыі. Бясколерны ці блакітнаваты, шэры. Бляск шкляны. Цв. 3,5—3,8. Шчыльн. 2,9—3 г/см$^3$. Паглынаючы ваду, пераходзіць у гіпс. Асадкавы гідратэрмальны мінерал. Выкарыстоўваецца як звязвальнае рэчыва, угнаенне, сыравіна для атрымання сернай к-ты, вырабны камень. 2) Асадкавая парода, складаецца пераважна з мінералу ангідрыту. Выкарыстоўваюць як угнаенне, цэмент і інш. На Беларусі трапляецца ў адкладах сярэдняга і верхняга дэвону.

**АНГІЛЕ́ЙКА** Фёдар, бел. гравёр па дрэве канца 17 — пач. 18 ст. Прадстаўнік *Магілёўскай школы гравюры*. Аўтар гравюр у кн. «Ирмолой сиречь Осмогласник» Іаана Дамаскіна (1700), «Часослов сиречь Последованию службы» (1703), выдадзеных у друкарні М.*Вашчанкі* (Магілёў). Гравюрам А. характэрна прастата тэхн. прыёмаў і нескладанасць кампазіцыі, што збліжае іх з творамі нар. мастацтва.

**АНГІ́ЛЬЯ**, Ангуіла (Anguilla), уладанне Вялікабрытаніі ў Вест-Індыі, на а-вах Ангілья і Самбрэра ў паўн. частцы М. Антыльскіх а-воў. Пл. 91 км$^2$. Нас. 8,8 тыс. чал. (1992), пераважна афр. паходжання. Афіцыйная мова — англійская. Пануючая рэлігія пратэстантызм (англіканства і метадызм). Адм. цэнтр — г. Валі. Нац. свята — Дзень Ангільі (20 мая).

**Прырода.** А. — нізкі вапняковы востраў, акаймаваны рыфамі. Развіты карст. Клімат трапічны пасатны, гарачы. Сярэднямесячныя т-ры паветра 18—24 °С. Ападкаў 700—1200 мм за год. Характэрны моцныя ўраганы ў канцы лета. Глебы чырваназёмныя, расліннасць — другасная саванна.

**Гісторыя.** Востраў адкрыты ў 1493 Х.Калумбам. Першыя паселішчы засн. ў 1631 галандцамі. З 1650 англ. калонія, якую ў 1745 і 1796 спрабавала захапіць Францыя. З 1882 А. адміністрацыйна аб'яднана з а-вамі Сент-Кітс і Невіс; разам з імі ўваходзіла ў 1958—62 у Вест-Індскую федэрацыю; у лют. 1967 астравы набылі статус «асацыіраванай з Вялікабрытаніяй дзяржавы». Пасля заявы пра разрыў з Сент-Кітсам і Невісам (1967) А. ў лют. 1969 у аднабаковым парадку абвясціла сябе незалежнай рэспублікай. У сак. 1969 Вялікабрытанія высадзіла на А. свае войскі і



Ангідрыт.

аднавіла кантроль над востравам. У 1976 А. атрымала частковае самакіраванне. Аддзяленне А. ад астатніх астравоў у 1980 замацавана англ. парламентам. Дзейнічаюць Нац. альянс, Дэмакр. партыя.

**Гаспадарка.** Аснову эканомікі складаюць турызм, вытв-сць лодак, здабыча солі і морапрадуктаў. С.-г. патэнцыял абмежаваны. Апрацоўваецца 5% тэрыторыі. Доля сельскай гаспадаркі і рыбалоўства не перавышае 10% валавога ўнутр. прадукту (ВУП). Асн. культуры — батат, гарох, сорга, кукуруза. На мясц. патрэбы гадуюць авечак, коз, свіней. Вядзецца лоўля рыбы і амараў, здабываецца соль. На турызм прыпадае 29% (1987) ВУП. Асн. транспарт — аўтамабільны. Працягласць дарог 90 км, з іх 46 км з цвёрдым пакрыццём. 2 гаванi — Роўд-Бей і Блоўінг-Пойнт. Аэрапорт Уолблейк. У пач. 1990 у А. зарэгістравана 45 замежных аддз. банкаў. Знешняя фін. дапамога (у асн. Вялікабрытаніі) складае каля 3 млн. долараў за год. А. экспартуе соль у Трынідат і Табага, амараў на сумежныя астравы (асн. крыніца экспартных паступленняў каля 64% прыбытку ў 1987). Грашовая адзінка — усх.-карыбскі долар.

**АНГІ́НА** (лац. angina літар. ўдушша), вострая інфекцыйная хвароба з запаленнем міндалін, пераважна паднябенных. Узбуджальнік А. — звычайна гемалітычны стрэптакок; перадаецца хвароба праз кантакты з хворым, праз ежу і пітво. А. можа быць сімптомам некаторых інфекц. захворванняў (дыфтэрыя, шкарлятына, адзёр), пры хваробах крыві і крывятворных органаў. Захворванню спрыяе агульнае і мясц. ахаладжэнне арганізма. Бывае катаральная (пачырваненне, прыпухласць слізістай абалонкі міндалін), лакунарная (у лакунах — паглыбленнях міндалін з'яўляецца фібрынозны налёт, які выступае на паверхні міндаліны ў выглядзе белых, шэрых палосаў), фалікулярная (нагнаенне лімфозных фалікул, што выступаюць пад слізістай абалонкай у выглядзе буйных

Ф.Ангілейка. «Успенне Багародзіцы». Гравюра на дрэве ў кнізе «Ирмолой сиречь Осмогласник» Іаана Дамаскіна. Магілёў. 1700.

жоўтых кропак), флегманозная (запаленне тканак вакол міндаліны, каляміндалінавы абсцэс). Асн. сімптомы А.: боль у горле, недамаганне, павышаная тэмпература (38—40°). Працягласць хваробы — 4—7 дзён. Ускладненні: рэўматызм, энда-, міякардыт, нефрыт. Лячэнне А.: пасцельны рэжым, цёплая, негустая ежа, сагравальныя кампрэсы, павязкі на шыю, паласканне горла (1—2%-ным растворам борнай к-ты, растворам марганцавакіслага калію, кухон-

най солі), гарачкапаніжальныя (аспірын), сульфаніламіды, антыбіётыкі (пры цяжкім стане). Пры абсцэсах неабходна іх ускрыццё. *В.А.Быстрэнін.*

**А́НГІРАС**, у ведыйскай і індуісцкай міфалогіі вялікі мудрэц; пасрэднік паміж багамі і людзьмі, родапачынальнік паўбагоў-ангірасаў. А. лічаць трэцім сынам *Брахмы*, аўтарам многіх гімнаў «*Рыгведы*», з яго імем звязваюць вобраз заканадаўца і астранома.

**АНГІЯ**... (ад грэч. angeion сасуд), першая састаўная частка складаных слоў, якая па значэнні адпавядае словам «сасуд», «сасудзістая сістэма», напр. *ангіялогія, ангіяспазма.*

**АНГІЯГРА́ФІЯ** (ад *ангія...* + *...графія*), метад рэнтгеналагічнага даследавання крывяносных і лімфатычных сасудаў пасля ўвядзення ў іх кантрастнага рэчыва. Дазваляе выявіць стан сасудаў, а таксама паталаг. працэсы ў органах, звязаныя са зменамі кровазабеспячэння або лімфазвароту.

**АНГІЯЛІ́НІ** Каэтан (1748, Італія — 1816), архітэктар. Жыццё і творчасць А. звязаны з Беларуссю. Вучыўся ў Балонні і Вероне. У 1784 пераехаў у Полацк. З 1786 у Віцебску, выкладаў франц. мову, у 1789—96 — тэорыю архітэктуры ў калегіуме езуітаў. У 1796—97 жыў у Оршы. Вярнуўшыся ў Віцебск, выкладаў архітэктуру і кіраваў буд-вам касцёлаў. Стваральнік алтара ў Віцебскім езуіцкім касцёле. У 1803—05 жыў у Полацку, потым выехаў у Італію.

**АНГІЯЛО́ГІЯ** (ад *ангія...* + *...логія*), раздзел *анатоміі* і клінічнай медыцыны, які вывучае крывяносныя і лімфатычныя сасуды і іх хваробы. А. даследуе сістэму крова- і лімфазабеспячэння органаў, размяшчэнне сасудаў у прасторы (ангіяархітэктоніка), форму і тыпы анастамозаў, інервацыю сасудзістай сістэмы.

Развіццю А. як навукі спрыялі адкрыцці 17 ст. ў галіне анат. даследаванняў крывяноснай (англ. ўрач У.Гарвей, італьян. М.Мальпігі) і лімфатычнай (італьян. анатам Г.Азелі) сістэм. У канцы 19 — пач. 20 ст. на Беларусі праведзены першыя аперацыі на сасудах — лігіраванне буйных артэрый (Ф.В.Абрамовіч, А.Я.Мітрашэнка, М.Ю.Рудэльсон). У 1950-я г. ўкаранёна ў практыку сасудзістае шво (С.Г.Сідранок), метады лячэння вострай закупоркі артэрый і вен (Ц.Е.Гніларыбаў). У 1960-я г. створана ангіяхірург. служба рэспублікі (І.М.Грышын, А.А.Марціновіч).

Даследаванні па А. вядуцца ў Рэспубліканскім і абл. цэнтрах сасудзістай хірургіі, Бел. ін-це ўдасканалення ўрачоў, НДІ кардыялогіі, мед. ін-тах. Асвоены сучасныя метады лячэння буйных сасудаў (Грышын, М.Дз.Князеў), іх пластыка і пратэзаванне, аўтавянозная пластыка (А.У.Шот, І.А.Давыдоўскі), хірург. пластыка нырачных артэрый пры сімптаматычнай гіпертаніі (А.М.Саўчанка, У.П.Крылоў), на сонных артэрыях (Давыдоўскі, В.А.Янушка). Распрацаваны метады лячэння пры раненнях крывяносных сасудаў (А.У.Руцкі), пры хранічнай вянознай недастатковасці (П.М.Дземяшкевіч, Марціновіч), на дробных сасудах (У.М.Падгайскі). Гл. таксама ў арт. *Нейрахірургія, Кардыялогія, Мікрахірургія.* *І.М.Грышын.*

**АНГІЯСПА́ЗМА** (ад *ангія...* + *спазма*), перыядычнае спазматычнае звужэнне прасвету *артэрый*, што прыводзіць да абмежаванага кровазабеспячэння (ішэмія) адпаведнага органа або тканкі. Узнікненню спрыяюць інтаксікацыя (алкаголь, нікацін), прафесійныя шкоднасці (вібрацыя, серавугляродсвінец і інш.), пераахаладжэнне, ачагі факальнай інфекцыі, псіхатраўмы. Часта бывае ў паталагічна зменены сасудах, асабліва пры атэрасклерозе і гіпертанічнай хваробе. Працяглая спазма сасудаў сэрца можа выклікаць стэнакардыю і быць прычынай інфаркту міякарда. Пры А. назначаюць спазмалітычныя прэпараты, лечаць асн. хваробу.

**АНГІЯТЭНЗІ́Н**, ангіятанін, гіпертэнзін, біялагічна актыўнае рэчыва, што павышае крывяны ціск. Поліпептыд, складаецца з некалькіх амінакіслот, утвараецца з ангіятэнзінагену, які намнажаецца ў крывяной плазме пры недастатковым забеспячэнні нырак крывёю; састаўная частка рэнін-ангіятэнзінавай сістэмы, што ўдзельнічае ў рэгуляванні тонусу сасудаў. Сінтэзаваны біял. актыўныя аналагі натуральнага А., якія выкарыстоўваюцца як лек. сродкі.

**АНГКО́Р**, комплекс індуісцкіх і будыйскіх храмаў, палацаў, вадасховішчаў і адводных каналаў каля г. Сіемрэап (Камбоджа). Пабудаваны ў 9—13 ст. Выяўлены ў джунглях у 19 ст.

Захаваліся руіны стараж. сталіц Камбоджы Яшодхарапуры (засн. ў канцы 9 ст.) і Ангкор-Тхома (засн. ў канцы 12 ст.—1432, пл. 7,9 км$^2$, цэнтр. храм Баён) — каменныя цокалі драўляных палацаў, «храмы-горы» ў выглядзе ступеньчатых пірамід, у т.л. буйнейшы Ангкор-Ват (каля 1113—50; пл. 1300 м × 1500 м, вышыня 66 м). Вызначаецца строга геам. планам, велічнай гармоніяй кампазіцыі: «храм-гару» абкружаюць галерэі з каланадамі, павільёнамі варот і вуглавымі вежамі. Багатае скульпт. ўбранне А.: рэльефы з батальнымі і быт. сцэнамі, фігурамі міфалагічных істот, у Ангкор-Тхоме гіганцкія твары багоў на вежах варот і храма Баён. Сілуэт вежаў Ангкор-Вата змешчаны на гербе Камбоджы.

Да арт. Ангкор. Фрагмент барэльефа храма Ангкор-Ват.

*Літ.*: Маршаль А. Ангкор: Пер. з фр. М., 1964.

**А́НГЛА-АМЕРЫКА́НСКАЯ ВАЙНА́ 1812—14.** Выклікана гандл.-эканам. супярэчнасцямі паміж Англіяй і ЗША, а таксама захопніцкай палітыкай пэўных амер. колаў у адносінах да Канады. Зачэпкай да вайны паслужылі захопы і вобыскі англ. флотам амер. суднаў у адкрытым моры. У чэрв. 1812 ЗША аб'явілі вайну Англіі. Англічане перакінулі свае войскі ў Паўн. Амерыку. На моры Англія панесла значныя страты, але і спробы амерыканцаў уварвацца ў Канаду поспеху не мелі. Перамогі на азёрах Эры (вер. 1813) і Шамплейн (вер. 1814) забяспечылі ЗША кантроль над важнымі воднымі шля-

хамі. Англ. войскі блакіравалі ўзбярэжжа ЗША, у жн. 1814 захапілі Вашынгтон, аднак развіць наступленне не змаглі. Баявыя дзеянні амер. войскаў набылі характар барацьбы за захаванне незалежнасці краіны. У 1814 у г. Гент (Бельгія) падпісаны дагавор, які аднавіў даваен. становішча.

**А́НГЛА-АРГЕНЦІ́НСКІ КАНФЛІ́КТ 1982,** Фалклендская вайна, ваенныя дзеянні паміж Аргенцінай і Вялікабрытаніяй у крас.—чэрв. 1982 за Фалклендскія (Мальвінскія) а-вы і в-аў Паўд. Георгія. Спасылаючыся на свае гіст. правы, Аргенціна 2—3 крас. высадзіла дэсант на Фалклендскія а-вы і Паўд. Георгію. Англ. гарнізон (каля 100 чал.) і губернатар а-воў былі высланы на радзіму. У адказ брыт. ўрад разарваў адносіны з Аргенцінай і адправіў да Фалклендаў ваен. эскадру (каля 40 баявых караблёў з 10 тыс. марскіх пехацінцаў). Міжнар. намаганні па мірным вырашэнні канфлікту пацярпелі няўдачу. У выніку баявых дзеянняў (канец крас. — май) патоплены аргенцінскі крэйсер «Хенераль Бельграна» і англ. эсмінец «Шэфілд». 21 мая пачаўся штурм Фалклендскіх а-воў. 15 чэрв. аргенцінскія войскі капітулявалі. Аргенціна страціла 1300 чал., Англія — 250 забітымі і 300 параненымі. Вялікабрытанія стварыла на а-вах ваен.-паветр. і ваен.-марскую базы з 7-тысячным гарнізонам. Паражэнне Аргенціны прывяло да звяржэння ўлады ваенных у краіне.

**А́НГЛА-АФГА́НСКІЯ ВО́ЙНЫ,** каланіяльныя войны Англіі супраць Афганістана. У першую А.-а.в. (1838—42) англ. войскі занялі (1839) гарады Кандагар, Газні, Кабул. У выніку партыз. вайны, якая перарасла ў нар. паўстанне (1841), акупац. армія была знішчана. У 1842 Англія прызнала паражэнне і пакінула Афганістан. У час другой А.-а.в. (1878—80) англ. войскі занялі г. Кандагар. Эмір Якубхан заключыў з Англіяй Гандамакскі дагавор, які выклікаў у 1879 нар. паўстанне. У 1880 пад Майвандам (каля Кандагара) афганцы разбілі англ. брыгаду. Англія адмовілася ад намеру завяваць Афганістан, аднак дамаглася свайго кантролю над яго знешняй палітыкай. Трэцяя А.-а.в. пачалася ў маі 1919 пасля абвяшчэння Афганістанам незалежнасці. Паражэнне англ. войскаў у выніку паўстання пуштунскіх плямёнаў, а таксама ўздым рэв. руху ў Індыі змусілі Англію заключыць у чэрв. 1919 перамір'е, у жн. 1919 — прэлімінарны мірны дагавор.

**А́НГЛА-БЕЛАРУ́СКАЕ ТАВАРЫ́СТВА** (АБТ). Заснавана ў 1954 у Лондане членамі *Згуртавання беларусаў у Вялікабрытаніі*, дзеячамі бел. эміграцыі і англ. навукоўцамі-беларусістамі для пашырэння ведаў пра Беларусь сярод англічан. Разам з *Беларускай бібліятэкай і музеем імя Францішка Скарыны ў Лондане* з'яўляецца цэнтрам бел. навук.-культ. жыцця ў Англіі. У 1965—88 выпускала «The Journal of Byelorussian studies» («Часопіс беларускіх даследаванняў»), у якім славісты ЗША, Ізраіля, Германіі, Англіі, Польшчы друкавалі артыкулы па гісторыі, палітыцы, культ. праблемах жыцця бел. народа. З 1966 АБТ арганізуе штогадовыя курсы лекцый па гісторыі л-ры і культуры Беларусі. Супрацоўнічае з Асацыяцыяй славістаў ун-таў Вялікабрытаніі, Брыт. Нац. Асацыяцыяй усх.-еўрап. даследаванняў, удзельнічае ў міжнар. канферэнцыях і кангрэсах славістаў. Выдала кн. апавяданняў С.Яновіча (1974), «Беларускую граматыку» П.Мэё (1976, на англ. мове), зб. вершаў М.Багдановіча, А.Гаруна, З.Бядулі (1983, на бел. і англ. мовах). Прэзідэнты АБТ: Л.Гарлех (1965—73), А.Макмілін (з 1974), старшыні: О.Герберт (1965—73), Д.Джоліф (1974—80), Дж.Дзінглі (з 1981).

*А.С.Ляднёва.*

**А́НГЛА-БІРМА́НСКІЯ ВО́ЙНЫ,** захопніцкія войны Англіі супраць Бірмы (цяпер М'янма). У першай А.-б.в. (1824—26) англ. войскі сустрэлі ўпартае супраціўленне бірманскай арміі на чале з Бандулам. Аднак пасля смерці Бандулы англічанам удалося прасунуцца да бірманскай сталіцы Ава. Паводле навязанага Бірме дагавора яна страціла вобласці Аракан, Тэнасерым, княствы Асам і Маніпур, абавязвалася выплаціць кантрыбуцыю і заключыць з Англіяй гандл. дагавор. У выніку другой А.-б.в. (1852) да англ. уладанняў далучана бірманская вобл. Пегу. У трэцяй А.-б.в. (1885) бірманская армія разгромлена і капітулявала. Бірма трапіла пад англ. панаванне і ўключана ў склад Індыі як асобная правінцыя.

**А́НГЛА-БУ́РА-ЗУЛУ́СКАЯ ВАЙНА́ 1838—40,** захопніцкая вайна бурскіх і англ. каланізатараў супраць плямёнаў зулу на Пд Афрыкі. Ваен. дзеянні пачаліся ў крас. 1838. У снеж. буры з дапамогай англ. каланістаў нанеслі паражэнне зулусам. Пасля высадкі англ. рэгулярных войскаў зулускія кіраўнікі заключылі з іх камандаваннем пагадненне (сак. 1839), паводле якога землі на Пд ад р. Тугела адыходзілі бурам. На гэтай тэр. створана бурская рэспубліка Натал. На пач. 1840 буры аднавілі ваен. дзеянні і разгромілі зулускія войскі. У люг. 1840 да рэспублікі Натал далучаны землі паміж рэкамі Тугела і Блэк-Умфалозі.

**А́НГЛА-БУ́РСКАЯ ВАЙНА́ 1899—1902,** захопніцкая вайна Англіі супраць бурскіх рэспублік Паўд. Афрыкі Трансвааль і Аранжавая. Англія імкнулася захапіць землі, багатыя золатам і алмазамі, забяспечыць брыт. панаванне на вялізнай тэр. ад Каіра да Кейптаўна. Падставай да вайны з'явілася адмова прэзідэнта Трансвааля даць выбарчыя правы англ. каланістам. 11.10.1899 пачаліся ваен. дзеянні, на пачатку якіх буры атрымалі некалькі перамог. Аднак вял. перавага ў жывой сіле і тэхніцы дазволіла англічанам у 1900 акупіраваць рэспублікі. Буры разгарнулі партыз. барацьбу, але, не атрымаўшы чаканай дыпламат. дапамогі з боку Германіі, Францыі і Расіі, спынілі супраціўленне. Паводле мірнага дагавора 31.5.1902 Аранжавая і Трансвааль далучаны да Брыт. імперыі і сталі англ. калоніямі. У 1910 іх тэр. ўвайшлі ў англ. дамініён *Паўднёва-Афрыканскі Саюз.*

**А́НГЛА-ГАЛА́НДСКІЯ ВО́ЙНЫ 17 СТАГО́ДДЗЯ,** выкліканы гандлёва-эканамічным і каланіяльным саперніцтвам Англіі і Галандыі. Вяліся ў асн. на моры. Першая А.-г.в. (1652—54) пачалася з-за прыняцця англ. парламентам Навігацыйнага акта 1651, накіраванага супраць галандскага пасрэдніцкага гандлю. Паводле Вестмінстэрскага мірнага дагавора 1654 Галандыя прызнала Навігацыйны акт. Другая А.-г.в. (1665—67) аб'яўлена Галандыяй у адказ на захоп (1664) англічанамі галандскай калоніі ў Паўн. Амерыцы — Новага Амстэрдама. Паводле Брэдскага міру 1667 Новы Амстэрдам перайшоў да Англіі, апошняя вярнула Галандыі захоплены ў час вайны Сурынам. Трэцяй А.-г.в. (1672—74) на баку Англіі выступіла Францыя. Перамога Галандыі над англа-франц. флотам пры Тэкселе (1673) і інш. абставіны прымусілі Англію выйсці з вайны. Паводле Вестмінстэрскага мірнага дагавора 1674 заставаўся правамоцны Брэдскі трактат 1667.

**А́НГЛА-ГЕРМА́НСКАЕ МАРСКО́Е ПАГАДНЕ́ННЕ 1935.** Заключана 18 чэрв. ў выглядзе абмену нотамі паміж англ. міністрам замежных спраў С.Хорам і спец. упаўнаважаным А.Гітлера І.Рыбентропам. Паводле пагаднення Германія атрымала права мець флот, роўны 35% танажу агульнага водазмяшчэння флоту Брыт. імперыі, падводны флот — у межах 45% танажу падводных лодак краін Брыт. імперыі і ў далейшым магла давесці свой падводны флот да ўзроўню брытанскага. Пагадненне парушала ўмовы *Версальскага мірнага дагавора 1919.* Дэнансавана фаш. Германіяй у крас. 1939 ва ўмовах падрыхтоўкі Германіі да 2-й сусв. вайны.

**А́НГЛА-ГЕРМА́НСКАЯ ДЭКЛАРА́ЦЫЯ 1938** аб ненападзенні. Падпісана 30 вер. ў Мюнхене брыт. прэм'ер-міністрам Н.Чэмберленам і А.Гітлерам адразу пасля заключэння *Мюнхенскага пагаднення 1938.* Фактычна ўзмацніла пазіцыі фаш. Германіі, давала ёй поўную свабоду дзеянняў, чым садзейнічала развязванню 2-й сусв. вайны.

**А́НГЛА-ЕГІ́ПЕЦКАЕ ПАГАДНЕ́ННЕ 1954.** Падпісана 19 кастр. ў Каіры. Прадугледжвала вывад англ. войскаў з зоны Суэцкага канала на працягу 20 месяцаў,

давала Англіі права 7 гадоў карыстацца Суэцкай базай. Да чэрв. 1956 эвакуацыя англ. войскаў завершана. У сувязі з удзелам Англіі ў кастр.—ліст. 1956 (разам з Францыяй і Ізраілем) у нападзенні на Егіпет яго ўрад 1.1.1957 анулявaў пагадненне, пазбавіўшы тым самым Англію ваен.-стратэг. пазіцый у Егіпце.

**А́НГЛА-ЕГІ́ПЕЦКІ ДАГАВО́Р 1936** аб дружбе і саюзе. Падпісаны 26 жн. ў Лондане. Пашыраў самастойнасць Егіпта ва ўнутр. і знешніх справах: скасоўваўся інстытут англ. саветнікаў пры ўрадзе Егіпта, павялічвалася егіп. армія, Англія абавязвалася падтрымаць хадайніцтва Егіпта аб уступленні ў Лігу Нацый, фармальна спынялася акупацыя Егіпта англ. войскамі. Адначасова дагавор захоўваў асн. ваен. пазіцыі англічан (у зоне Суэцкага канала ёй дазвалялася трымаць да 10 тыс. войска). Дэнансаваны Егіптам у 1951. Англія прызнала яго адмену па *Англа-егіпецкім пагадненні 1954.*

**А́НГЛА-ІРА́КСКІЯ ДАГАВО́РЫ І ПАГАДНЕ́ННІ 1922, 1926, 1930, 1948, 1955.** Дагавор 1922, заключаны на 20 гадоў, фактычна аформіў мандатную залежнасць Ірака ад Вялікабрытаніі. Дагавор 1926 прадаўжаў тэрмін дзеяння папярэдняга да 1950 (калі Ірак да гэтага часу не стане чл. Лігі Нацый, што аўтаматычна пазбаўляла яго англ. мандата). Дагавор 1930 падпісаны на 25 гадоў, прадугледжваў адмену мандата і прызнаваў суверэнітэт Ірака (уступіў у сілу ў 1932 пасля прыняцця Ірака ў Лігу Нацый); фактычна захаваў залежнасць Ірака ад Вялікабрытаніі ў знешняй палітыцы і ваен. справах. Дагавор 1948 прадугледжваў стварэнне «камісіі сумеснай абароны», тэр. Ірака заставалася базай англ. узбр. сіл. Пагадненне 1955 захоўвала кантроль Англіі над іракскай арміяй і ваенна-паветр. базамі; англ. ваенна-паветр. сілы заставаліся ў Іраку. Дэнансавана 24.3.1959 урадам Іракскай рэспублікі пасля *Іракскай рэвалюцыі 1958.*

**А́НГЛА-ІРЛА́НДСКАЯ У́НІЯ 1801**, пагадненне аб саюзе Англіі і Ірландыі. Заключана 7.6.1800 у г. Дублін; набыло сілу 1.1.1801. Ініцыіравана Англіяй пасля задушэння ірл. паўстання 1798. Ірландыя станавілася часткай Злучанага каралеўства Вялікабрытаніі і Ірландыі, яе парламент скасоўваўся, краіна магла пасылаць 100 дэпутатаў у палату абшчын і 32 — у палату лордаў брыт. парламента. Апошні атрымаў права выдаваць законы для Ірландыі, а англ. палата лордаў ператваралася ў вярх. апеляцыйную інстанцыю для ірл. судоў. Ірландыя стала англ. правінцыяй. Гэта выклікала новую хвалю нац.-вызв. руху ірландцаў, у т.л. выступленне ў 1803 пад кіраўніцтвам Р.*Эмета.*

**А́НГЛА-ІРЛА́НДСКІ ДАГАВО́Р 1921.** Падпісаны 6 снежня прадстаўнікамі ўрада Ірл. Рэспублікі і англ. ўрада. Заключаны ва ўмовах вызв. вайны ірл. народа (1919—21) супраць англ. ўладарання, меў кампрамісны характар. Паўд. і Цэнтр. Ірландыі (26 графстваў), якая стала называцца Ірл. Свабоднай дзяржавай, надаваўся статус дамініёна. Паўн. ч. краіны — *Ольстэр* — заставалася ў складзе Вялікабрытаніі. У 1949 Ірландыя (без Ольстэра) абвешчана рэспублікай.

**А́НГЛА-КІТА́ЙСКАЯ ВАЙНА́ 1840—42** (т.зв. першая «опіумная» вайна), агрэсіўная вайна Англіі супраць Кітая з мэтай захапіць рынак і дамагчыся паліт. ўплыву на Кітай. Зачэпкай да яе стала знішчэнне кіт. урадам вял. партыі кантрабанднага опіуму, канфіскаванага ў замежных гандляроў. Летам 1840 англ. войскі блакіравалі з мора кіт. парты, захапілі в-аў Сянган (Ганконг) і ў жн. 1842 наблізіліся да Нанкіна. Паводле Нанкінскага дагавора 1842 Англія атрымала в-аў Ганконг, значную кантрыбуцыю, 5 партоў Кітая сталі адкрытымі для англ. гандлю. Вайна была пачаткам ператварэння Кітая ў паўкалан. дзяржаву.

**А́НГЛА-МАЙСУ́РСКІЯ ВО́ЙНЫ**, вяліся англ. Ост-Індскай кампаніяй дзеля захопу інд. княства Майсур. У выніку першай (1767—69) і другой (1780—84) А.-м.в. Майсур захаваў сваю незалежнасць. У трэцяй А.-м.в. (1790—92) англічанам удалося перацягнуць на свой бок войскі маратхаў і княства Хайдарабад. Паводле Серынгапатамскага міру 1792 майсурцы аддалі саюзнікам амаль палавіну сваёй тэр., заплацілі кантрыбуцыю. У чацвёртай А.-м.в. (1799) англічане штурмам узялі сталіцу майсурцаў Серынгапатам і ператварылі Майсур у васальнае княства англ. кампаніі.

**А́НГЛА-МАРА́ТХСКІЯ ВО́ЙНЫ**, захопніцкія войны англ. Ост-Індскай кампаніі супраць маратхскіх княстваў у Індыі. У выніку першай А.-м.в. (1775—82) княствам навязаны Салбайскі дагавор 1782, паводле якога англ. кампанія атрымала некаторыя землі маратхаў. У другой А.-м.в. (1803—05) маратхі страцілі ч. сваёй тэр. і прызналі сябе васаламі. У трэцяй А.-м.в. (1817—18) адны князі падпарадкаваліся англічанам, іншыя аказалі супраціўленне, аднак былі разгромлены. Значная ч. маратхскай тэр. была анексіравана англ. кампаніяй.

**А́НГЛА-РАСІ́ЙСКІЯ ПАГАДНЕ́ННІ 1873, 1885, 1907** пра размежаванне сфер уплыву на Сярэднім Усходзе. Пагадненне 1873 аб «буферным» поясе ў Сярэдняй Азіі — вынік міжурадавых перагавораў у кастр. 1872 — студз. 1873. Размежавала сферы ўплыву Расіі і Вялікабрытаніі ў Сярэдняй Азіі і вызначыла паўн. граніцу афг. эмірата па р. Амудар'я. Пагадненне 1885 аб размежаванні афганскіх уладанняў падпісана ў Лондане 10 верасня. Урэгулявала рас.-афг. канфлікт 1885, выкліканы далучэннем Туркменіі да Расіі і звязаны з сутыкненнем рас. і афг. войскаў пры Ташкепры (на Пн ад Кушкі). Пагадненнем вызначаны склад англ.-рас. размежавальнай камісіі, якая ў 1887 устанавіла новую рас.-афг. граніцу па левым беразе Амудар'і. Пагадненне 1907 аб размежаванні інтарэсаў у Іране, Афганістане і Тыбеце падпісана 31 жн. ў Пецярбургу. Паводле яго Іран быў падзелены на тры зоны: паўн. (рас.), паўд. (англ.) і нейтральную — паміж імі; Расія фактычна прызнала брыт. пратэктарат над Афганістанам (пры ўмове непадзельнасці яго тэрыторыі); бакі прызнавалі тэр. цэласнасць і ўнутр. кіраванне Тыбета. Пагадненне практычна ўключала Расію ў Антанту; анулявана ўрадам Сав. Расіі ў студз. 1918.

**А́НГЛА-САВЕ́ЦКА-ІРА́НСКІ ДАГАВО́Р 1942** аб саюзе. Падпісаны 29 студз. ў Тэгеране. Яго падпісанню папярэднічаў часовы ўвод сав. і англ. войскаў у Іран у жн.—вер. 1941 з мэтай перашкодзіць фаш. Германіі выкарыстаць тэрыторыю і рэсурсы Ірана ў вайне супраць СССР і Англіі. Дагавор забяспечваў супрацоўніцтва Ірана з *антыгітлераўскай кааліцыяй* у 2-й сусв. вайне. СССР і Англія абавязваліся абараняць Іран ад агрэсіі з боку Германіі або інш. дзяржавы, не займаць пазіцыі, якая магла б пашкодзіць інтарэсам Ірана ва ўзаемаадносінах з інш. краінамі. Іран у сваю чаргу абавязваўся не ўсталёўваць адносін, несумяшчальных з дагаворам. Пасля заканчэння 2-й сусв. вайны войскі саюзнікаў выведзены з Ірана.

**АНГЛАСАКСО́НСКАЕ ЗАВАЯВА́ННЕ**, заваяванне Брытаніі паўн.-герм. плямёнамі англаў, саксаў, ютаў і фрызаў у 5—6 ст. Іх пірацкія напады на Брытанію з сярэдзіны 5 ст. змяніліся перасяленнем у прыбярэжныя раёны і ў глыб краіны. Нягледзячы на ўпартае супраціўленне *брытаў* і *кельтаў*, большая частка Брытаніі да канца 6 ст. была заваявана, а брыты знішчаны, заваяваны або выцеснены ў Шатландыю, Уэльс і на кантынент. Склаліся англасаксонскія каралеўствы Кент, Уэсекс, Сусекс, Эсекс, Усх. Англія, Нартумбрыя, Мерсія.

**АНГЛАСА́КСЫ**, агульная назва германскіх плямёнаў — англаў, саксаў, ютаў і фрызаў, якія заваявалі ў 5—6 ст. кельцкую Брытанію (гл. *Кельты*). У 7—10 ст. у працэсе змяшання гэтых плямёнаў склалася англасаксонская народнасць, што ўвабрала і кельцкія элементы. Пазней А. змешваліся з датчанамі і

нарвежцамі, якія пасяліліся на ПнУ і У Англіі, і пасля *Нармандскага завяавання Англіі 1066* з выхадцамі з Францыі, што стала пачаткам фарміравання англ. народнасці (гл. *Англічане*).

**А́НГЛА-СІ́КХСКІЯ ВО́ЙНЫ**, захопніцкія войны англ. Ост-Індскай кампаніі супраць дзяржавы сікхаў у Пенджабе (Індыя). Справакаваўшы пагранічны канфлікт, англічане змусілі сікхаў пачаць ваен. дзеянні. У першай А.-с.в. (1845—46) сікхі, якія напачатку дамагліся ваен. поспехаў, пацярпелі паражэнне. Англічане захавалі Пенджабу ўяўную самастойнасць, аднак сікхі заплацілі за гэта часткай сваіх зямель. Другую А.-с.в. (1848—49) пачалі англічане пад выглядам барацьбы з мяцежнікамі. У 1849 сікхскія войскі разбіты і англ. кампанія захапіла Пенджаб.

**А́НГЛА-ТРАНСІАРДА́НСКІЯ ДАГАВО́РЫ 1928, 1946, 1948**. Дагавор 20.2.1928 заключаны ў Іерусаліме. Фармальна пакідаў пэўную ўладу ў Трансіарданіі (мандатнай тэр. Англіі) эмірам, але замацоўваў за Англіяй кантроль над знешняй палітыкай, фінансамі і ўзбр. сіламі. Дагавор 22.3.1946 аб дружбе і саюзе падпісаны ў Лондане на 25 гадоў. Фармальна адмяняў англ. мандат на Трансіарданію (аб'яўлялася незалежным каралеўствам), аднак захоўваў права трымаць войскі і будаваць ваен. базы на трансіарданскай тэрыторыі. Дагавор 15.3.1948 аб саюзе, падпісаны ў Амане тэрмінам на 20 гадоў, ставіў Іарданію ў залежнасць ад Англіі: для англ. войскаў выдзяляліся базы ў Амане і Мафраку; Англія захоўвала права ўводзіць свае войскі ў любы пункт Іарданіі ў выпадку вайны. Дагавор прадугледжваў стварэнне пастаяннага англа-іарданскага Савета абароны. Ануляваны 14.3.1957 урадам Набулсі.

**А́НГЛА-ФРА́НКА-КІТА́ЙСКАЯ ВАЙНА́ 1856—60** (т.зв. другая «опіумная» вайна), агрэсіўная вайна Англіі і Францыі супраць Кітая. Выкарыстаўшы грамадз. вайну ў Кітаі, Англія ў кастр. 1856 пачала супраць яго ваен. дзеянні. На пач. 1857 да яе далучылася Францыя. У канцы 1857 англа-франц. войскі захапілі Гуанчжоў (Кантон), у 1858 порт Дагу. Пагражаючы наступленнем на Цяньцзінь і Пекін, Англія і Францыя прымусілі кіт. ўрад падпісаць кабальныя Цяньцзіньскія дагаворы (1858). Праз год яны аднавілі ваен. дзеянні, у 1860 захапілі Цяньцзінь, Пекін. *Пекінскія дагаворы 1860* ператваралі Кітай у паўкалан. дзяржаву.

**А́НГЛА-ФРА́НКА-РУ́СКАЕ ПАГАДНЕ́ННЕ 1915** аб пралівах, сакрэтнае пагадненне, заключанае ў 1-ю сусв. вайну. Аформлена ў выглядзе абмену памятнымі запісамі і нотамі ў крас.—маі 1915. Прадугледжвала пасляваенны падзел Турцыі (саюзніцы Германіі): са згоды Англіі і Францыі да Расіі (у выпадку яе ўдзелу ў вайне да перамогі над герм. кааліцыяй) павінны былі перайсці г. Канстанцінопаль (цяпер Стамбул), пралівы Басфор, Дарданелы і сумежныя з імі раёны еўрап. і азіяцкай часткі Турцыі. Практычных вынікаў для Расіі не мела, бо анулявана Дэкрэтам аб міры 1917.

**А́НГЛА-ФРАНЦУ́ЗСКАЕ ПАГАДНЕ́ННЕ 1904**. Падпісана 8 крас. ў Лондане. Прадугледжвала ўзаемныя ўступкамі вырашыць спрэчныя каланіяльныя «правы» Вялікабрытаніі ў Егіпце, Францыі — у Марока. Разам з франка-рус. саюзам 1891—93 і англа-рус. пагадненнем 1907 стала асновай *Антанты*.

**А́НГЛА-ШАТЛА́НДСКАЯ У́НІЯ 1707**, пагадненне аб саюзе Англіі і Шатландыі, заключанае паміж іх парламентамі. Прадугледжвала аб'яднанне дзвюх краін у адзіную унітарную дзяржаву (Вялікабрытанію) з агульным 2-палатным парламентам (513 дэпутатаў ад Англіі, 61 — ад Шатландыі). У Шатландыі захоўвалася традыц. сістэма мясц. самакіравання, судаводства і адукацыі; уводзілася аднолькавая з Англіяй сістэма падаткаабкладання, ліквідаваліся ўсе мытныя бар'еры і інш. Спец. артыкулы пацвярджалі прэсвітэрыянскі лад шатл. царквы. Пагадненне ініцыравала Англія, каб умацаваць дынастычную унію з Шатландыяй, якая пахіснулася пасля смерці караля Вільгельма III (1702). Унія спрыяла стварэнню адзінай брыт. дзяржавы, паскорыла развіццё капіталізму ў Шатландыі. *У.Я.Калаткоў.*

Англезіт.

**А́НГЛА-ЯПО́НСКІ САЮ́З**, ваенна-паліт. саюз Англіі і Японіі супраць Расіі, а таксама для ўмацавання свайго панавання ў Кітаі і Карэі. Заключаны 30.1.1902. Прадугледжваў нейтралітэт у выпадку вайны саюзніка з інш. дзяржавай і аказанне яму дапамогі, калі да ваен. дзеянняў супраць саюзніка далучыцца іншая дзяржава або група дзяржаў. Саюз садзейнічаў развязванню *руска-японскай вайны 1904—05*. А.-я.с. аднаўляўся ў жн. 1905 і ліп. 1911. На *Вашынгтонскай канферэнцыі 1921—22* заменены пагадненнем ЗША, Вялікабрытаніі, Францыі і Японіі.

Карова англерскай пароды.

**АНГЛІ́Й** (франц. anglaise літар. англійская), агульная назва нар. англійскіх танцаў, якія былі пашыраны ў краінах Еўропы ў 17—19 ст. Музыкай блізкія да *экасеза*, формай — да *рыгадона*. Многія кампазітары (І.Фішэр, Ф.Філідор, І.С.Бах) уключалі танцы тыпу А. у інстр. сюіты.

**АНГЛЕЗІ́Т** (ад назвы в-ва Англсі ў Англіі), мінерал класа сульфатаў, сульфат свінцу, $Pb[SO_4]$. Мае 68,3% свінцу. Крышталізуецца ў рамбічнай сінганіі. Крышталі тонка і тоўстатаблітчастыя, прызматычныя; зярністыя і шчыльныя агрэгаты, жаўлакі. Бясколерны, белы, злёгку афарбаваны (шэры, жоўты, буры і інш.). Бляск шкляны да алмазнага, цьмяны. Цв. 3—3,5. Шчыльн. каля 6,4 г/см$^3$. Пераважна гіпергенавы, утвараецца ў зоне акіслення свінцовых рудаў. Свінцовая руда.

**АНГЛЕ́РСКАЯ ПАРО́ДА**, ангельская парода буйной рагатай жывёлы, парода малочнага кірунку. Выведзена ў 16 ст. ў Германіі на п-ве Ангельн на аснове мясцовай бура-чырвонай жывёлы. Гадуюць у многіх краінах Еўропы. Выкарыстоўваюць у скрыжаваннях пры вывядзенні і ўдасканаленні чырвоных парод жывёлы. За апошнія 10—15 гадоў дзякуючы селекцыі А.п. набыла і добрыя мясныя якасці.

Жывёла з моцнай канстытуцыяй, лёгкім касцяком, добра развітым вымем. Масць чырвоная рознага адцення (ад светлага да цёмнага). Жывая маса дарослых кароў 500—580, быкоў 850—1000 кг. Парода познаспелая, інтэнсіўнасць росту невысокая. Надой кароў за лактацыю 4460—4900 кг пры сярэдняй тлустасці малака 4,6—5%, рэкордны надой — больш за 10 тыс. кг. Забойны выхад у кароў 49% і больш, у быкоў на адкорме — 58%. *М.Ц.Міхедаў.*

**АНГЛІ́ЙСКАЯ МО́ВА**, адна з *германскіх моў*. Родная мова каля 400 млн. чал., другая мова для больш як 200 млн. насельніцтва Індыі, Пакістана і інш. (1992). Адзіная дзярж. мова больш як у 20 краінах, мае афіц. статус у розных краінах Азіі і Афрыкі, адна з 6 афіц. і рабочых моў ААН. Шматлікія рэгіянальныя варыянты А.м. (найб. значныя — брыт., амер., аўстрал., у межах якіх існуюць розныя мясц. дыялекты) адрозніваюцца пераважна фанетыкай і лексікай. А.м. вядзе пачатак ад мовы

англаў, саксаў і ютаў, што ў 5 ст. захапілі Брытанію. Фарміравалася пад уплывам кельцкай, скандынаўскіх і франц. моў. Сучасная А.м. мае сістэму фанем, амаль палова з якіх — галосныя. Граматычны лад пераважна аналітычны, асн. сродкі перадачы адносін паміж словамі і словазлучэннямі — службовыя словы і фіксаваны парадак слоў у сказе. Значная частка лексікі — запазычанні, асабліва з лац. і франц., а зараз таксама з яп., ісп. і інш. моў. Актыўныя спосабы словаўтварэння — афіксацыя, словаскладанне і безафікснае словаўтварэнне (канверсія). Пісьменства з 8—9 ст. на лац. аснове.

*З.А.Харытончык.*

**АНГЛІ́ЙСКАЯ СОЛЬ**, горкая соль, назва магнію сульфату ў якасці слабіцельнага сродку.

**АНГЛІ́ЙСКАЯ ХВАРО́БА**, захворванне, што ўзнікае ад дэфіцыту сонечнай энергіі, неабходнай для сінтэзу ў арганізме чалавека і жывёл вітаміну D. Пры першым апісанні ўрачы звязалі яе з вял. воблачнасцю над Брытанскімі а-вамі, асабліва над Лонданам (адсюль назва). Садзейнічае ўзнікненню А.х. таксама *смог*, які памяншае празрыстасць атмасферы (назіраецца над буйнымі гарадамі і прамысл. цэнтрамі).

**АНГЛІ́ЙСКІ КАНА́Л** (англ. English Channel), гл. *Ла-Манш*.

**АНГЛІ́ЙСКІЯ РЭВАЛЮ́ЦЫІ 17 СТАГО́ДДЗЯ**, раннія бурж. рэвалюцыі 1640—53 і 1688—89, выкліканыя паліт., рэліг. і сац.-эканам. супярэчнасцямі англ. грамадства. Звязаны паміж сабой перыядамі пратэктарату О.*Кромвеля* (1653—58) і рэжыму рэстаўрацыі (1660—88), у час якога склаліся перадумовы для 2-й рэвалюцыі.

Рэвалюцыя 1640—53, якая вызначалася жорсткай паліт., узбр. і рэліг. барацьбой, пачалася са склікання каралём Карлам I Сцюартам т.зв. *Доўгага парламента* (1640—53) для зацвярджэння падаткаў і субсідый, неабходных для фінансавання ваен. аперацый супраць паўстання ў Шатландыі. Парламент ператварыўся ў арганізац. цэнтр новага дваранства і буржуазіі, якіх падтрымлівала б.ч. сялян, рамеснікі і рабочыя. Парламенцкая апазіцыя патрабавала спыніць злоўжыванні з боку каралеўскай улады, кіраваць краінай разам з парламентам, даць свабоду прадпры-


A
DECLARATION
FROM THE
Poor oppreſſed People
OF
ENGLAND,
DIRECTED
To all that call themſelves, or are called
Lords of Manors,
through this NATION;
That have begun to cut, or that through
fear and covetouſneſs, do intend to cut down
the Woods and Trees that grow upon the
Commons and Waſte Land.
Printed in the Yeer, 1649

Да арт. **Англійскія рэвалюцыі 17 стагоддзя.** Тытульны ліст «Дэкларацыі беднага прыгнечанага народа Англіі», напісанай дыгерамі ў 1649.

мальніцтву, правесці пурытанскую рэфармацыю царквы. Кароль, які абапіраўся гал. чынам на феад. дваранства і англіканскую царкву, 22.8.1642 аб'явіў парламенту вайну. Леташ арганізаваная каралеўская армія на працягу года авалодала б.ч. Англіі. Ва ўмовах грамадз. вайны парламент заключыў саюз з Шатландыяй і правёў ваен. рэформу. Новая армія, створаная з сялян, дробных гандляроў і рамеснікаў, 14.6.1645 у бітве пры Нейзбі нанесла рашаючае паражэнне каралеўскаму войску. Кароль апынуўся ў палоне. Ахвярамі грамадз. вайны, якая цягнулася да 1646, сталі тысячы жыхароў Англіі. Паміж паліт.-рэліг. групоўкамі *прэсвітэрыян* (кансерватыўнай буржуазіі), *індэпендэнтаў* і *левелераў* пачалася складаная барацьба па пытаннях дзярж. ўладкавання Англіі. Калі ў канцы 1647 Карл I уцёк з-пад арышту, пачалася 2-я грамадз.

вайна, у якой кароль пацярпеў канчатковае паражэнне і 30.1.1649 пакараны смерцю. 19.5.1649 Англія абвешчана рэспублікай. Аднак англ. рэспубліка не мела моцнай сац.-паліт. апоры, у грамадстве не было рэсп. традыцый. Новая ўлада з дапамогай арміі лёгка расправілася са сваімі левымі ворагамі — левелерамі і *дыгерамі* («сапраўдныя» левелеры, заклікалі да маёмаснай роўнасці і калектывізму, іх праграма выкладзена ў т.зв. «Дэкларацыі беднага прыгнечанага народа Англіі»), але не змагла ліквідаваць пагрозу дыктатуры. Доўгі парламент, які к гэтаму часу страціў давер народа, быў гвалтоўна разагнаны лідэрам індэпендэнтаў Кромвелем. 16.12.1653 Кромвель абвешчаны лордам-пратэктарам Англіі, Ірландыі і Шатландыі, устанавіў ваенна-паліцэйскую дыктатуру. Пратэктарат, як і рэспубліка, не меў дастаткова моцнай падтрымкі. Пасля смерці Кромвеля (3.9.1658), кароткачасовага праўлення яго сына Рычарда (вер. 1658 — май 1659), праўленне парламента т.зв. другой рэспублікі (май 1659 — май 1660) адбылася рэстаўрацыя Сцюартаў. На англ. трон запрошаны сын Карла I, абвешчаны каралём Карлам II [1660—85]. Намер яго пераемніка Якава II [1685—88] устанавіць абсалютысцка-каталіцкі рэжым выклікаў незадаволенасць амаль усяго насельніцтва Англіі і новую рэвалюцыю 1688—89 (т.зв. «слаўную рэвалюцыю»), якая прайшла хутка, у форме бяскроўнага дзярж. перавароту. У 1688 лідэры буржуазіі і дваранства запрасілі на англ. прастол штатгальтэра Галандскай рэспублікі Вільгельма Аранскага, які ў студз. 1689 абвешчаны каралём Вільгельмам III. У кастр. 1689 выдадзены «Біль аб правах». Ён юрыдычна аформіў узаемаадносіны паміж каралём і парламентам: кароль пазбаўляўся права прыпыняць выкананне законаў, збіраць падаткі і набіраць войска без згоды парламента.

А.р. 17 ст. завяршыліся кампрамісам паміж бурж. сіламі і арыстакратыяй. У Англіі былі закладзены трывалыя асновы канстытуцыйна-манархічнай дзяржаўнасці, дэмакратыі і лібералізму; прызнаваліся правы пратэстантаў, пашыралася свабода прадпрымальніцтва, дваранскія зямельныя ўладанні сталі ўласнасцю іх трымальнікаў.

*Літ.*: Барг М.А. Великая английская революция в портретах ее деятелей. М., 1991; Английская буржуазная революция XVII века. Т. 1—2. М., 1954. *В.І.Сініца.*

**АНГЛІКА́НСКАЯ ЦАРКВА́**, англіканства, адна з пратэстанцкіх цэркваў; дзярж. царква Вялікабрытаніі. Узнікла ў Англіі ў 16 ст. на хвалі рэфармацыйнага руху ў выніку разрыву мясц. каталіцкай царквы з Рымам. У 1534 англ. парламент абвясціў на чале царквы караля Генрыха VIII. Каталіцкія элементы ў дагматыцы і культы былі дапоўнены пратэстанцкімі, і А.ц. пайшла «сярэднім шляхам» паміж *каталіцызмам* і *пратэстантызмам*. Яна захоўвае такую ж, як і ў каталіцызме, царкоўную іерархію, культавую рэгламентацыю, спалучае каталіцкі прынцып аб выратавальнай моцы царквы з пратэстанцкім аб выратаванні асабістай верай. Дагматычна адрозніваецца ад каталіцкай наяўнасцю 39 артыкулаў сімвала веры замест 12; у сферы культу не прызнае свечак, ладану, сутаны, споведзі і г.д. Самастойныя А.ц. існуюць таксама ў Шатландыі, Уэльсе, Ірландыі, ЗША, Канадзе, Аўстраліі і інш. краінах (усяго больш за 70 млн. вернікаў). Фармальна яны незалежныя, але з 1867 праз кожныя 10 гадоў англіканскія епіскапы збіраюцца ў Лондане (т.зв. Ламбецкія канферэнцыі), фактычна ўтвараючы такім чынам Англіканскі саюз цэркваў.

*Літ.*: Гараджа В.И. Протестантизм. М., 1971. *А.А.Цітавец.*

**АНГЛІЧА́НЕ**, нацыя, асн. насельніцтва *Вялікабрытаніі* (43,49 млн. чал.). Жывуць таксама ў Канадзе (каля 1 млн. чал.), Аўстраліі (больш за 944 тыс. чал.), ЗША (661 тыс. чал.), ПАР, Новай Зеландыі і інш. краінах. Агульная колькасць 47,22 млн. чал. (1987). Гавораць на *англійскай мове*. Паводле рэлігіі пераважна англікане.

**А́НГЛІЯ** (England), адміністрацыйна-палітычная частка Злучанага Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўн. Ірландыі, яго гіст. ядро. Займае большую ч. в-ва Вялікабрытанія. Назва ад стараж.-герм. племені англаў. А. часта называюць усё Злучанае Каралеўства (гл. *Вялікабрытанія*). Пл. 131 тыс. км², нас. 46,2 млн. чал. (1991; 54% усёй плошчы і 80% насельніцтва краіны). Падзяляецца на 39 графстваў, 6 метрапалітэнскіх графстваў і В. Лондан. Гал. горад — *Лондан*. Найбольшыя гарады і прамысл. цэнтры: Лондан, Бірмінгем, Манчэстэр, Ліверпул, Шэфілд, Лідс і інш. А. — эканамічна найб. развіты раён Вялікабрытаніі, дзе сканцэнтравана больш за 70% гарадоў (сярод іх 6 канурбацый — прамысл. цэнтраў, ускраіны якіх зліліся). Асн. галіны прам-сці: горназдабыўная, чорная металургія, металаапрацоўка, харчовая, тэкстыльная. Развіта машынабудаўнічая (аўта-, авія-, станка- і прыладабудаванне), электра- і радыётэхнічная, атамная прам-сць. На А. прыпадае больш за 70% пасяўной плошчы краіны, гэта асн. раён малочнай жывёлагадоўлі, агародніцтва і пладаводства. А. мае густую трансп. сетку, праз яе парты (Лондан, Ліверпул, Саўтгемптан і інш.) праходзіць каля 80% грузаабароту краіны.

**А́НГЛЫ** (лац. Anglii), старажытнагерманскае племя. Упамінаюцца ў 1 ст., у 4 — пач. 5 ст. жылі на Пд п-ва Ютландыя. У 5—6 ст. удзельнічалі ў *англасаксонскім завяванні* Брытаніі, дзе ўтварылі каралеўствы Мерсія, Усх. Англія і Нартумбрыя. Назва племя дала найменне ч. заваяванай краіны — Англія. А. разам з інш. плямёнамі склалі ў 7—10 ст. народнасць *англасаксаў*. Рэшткі А. на кантыненце зліліся з датчанамі.

**АНГО́Б** (франц. engobe), вадкая керамічная фарба на аснове белай ці каляровай гліны, прызначаная для дэкарыравання гліняных вырабаў. Для афарбоўкі выкарыстоўваюць солі металаў і керамічныя пігменты. А. можа пакрываць увесь выраб ці па малюнку. Пасля сушкі вырабы абпальваюць, часта пакрываюць празрыстай *глазурай*, размалёўкай. Танкамолаты А. з дабаўкамі наносяць на чарапіцу і інш. керамічныя вырабы для зніжэння парыстасці. Выкарыстоўваўся са стараж. часоў у дэкар.-прыкладным мастацтве Б. Усходу. Разнавіднасць А. — грэч. керамічныя лакі (terra argeta). У Зах. Еўропе ангабіраваныя глазураваныя вырабы наз. мецца-маёліка. На Беларусі А. выкарыстоўваюць з 12 ст. (ганчарны посуд, керамічныя пліткі і дробная пластыка з Гродна, Турава, Навагрудка, Полацка, Слоніма). На Івянецкай маст. фабрыцы (Валожынскі р-н) шырока выкарыстоўваюць каляровы А. для размалёўкі посуду і сувеніраў, фляндроўкі, размалёўкі ражком, пэндзлем і інш.

*М.Р.Казарог.*

**АНГО́ЛА** (Angola), Народная Рэспубліка Ангола (República Popular de Angola), дзяржава ў Паўд.-Зах. Афрыцы. Мяжуе на Пн і ПнУ з Заірам, на У з Замбіяй, на Пд з Намібіяй, на З абмываецца водамі Атлантычнага ак. Пл. 1246,7 тыс. км². Нас. 11,2 млн. чал. (1994). Афіц. мова — партугальская. Сталіца — г. *Луанда*. Падзяляецца на 18 правінцый (дыстрыктаў), уключае правінцыю Кабінда (паўанклаў). Нац. свята — Дзень абвяшчэння незалежнасці (11 ліст.).

Герб і сцяг Анголы.

**Дзяржаўны лад.** Паводле канстытуцыі 1975 з папраўкамі 1991 А. — рэспубліка. Кіраўнік дзяржавы і галоўнакамандуючы — прэзідэнт. Вышэйшы заканад. орган — Нац. асамблея. Выканаўчую ўладу ажыццяўляе Савет Міністраў.

**Прырода.** Большую ч. тэрыторыі займае пласкагор'е (пераважна выш. 1000—1500 м). На З горны масіў Біе (найб. выш. 2610 м, г. Мока). Уздоўж узбярэжжа шэраг невысокіх ступеньча-

тых плато шыр. ад 100 да 200 км і вузкая паласа прыморскай нізіны. Карысныя выкапні: нафта, прыродны газ, алмазы, медныя, жал., марганцавыя і уранавыя руды, баксіты, золата, тытан, плаціна, слюда. Клімат трапічны, гарачы, засушлівы зімой і вільготны летам. Сярэдняя т-ра найб. цёплага месяца (студз.) ад 21 да 29 °С, найб. халоднага (ліп.) ад 15 да 22 °С. Ападкаў ва ўнутр. раёнах 1000—1500 мм за год; на ўзбярэжжы, дзе ўплывае халоднае Бенгельскае цячэнне, — 50—500 мм за год. Гал. рэкі: Кванга, Касаі, Кунене, Кванза, частка эстуарыя р. Конга, на У верхняе цячэнне р. Замбезі. Значныя энергет. рэсурсы. Парогі і вадаспады перашкаджаюць суднаходству. Раслінасць унутр. раёнаў — сухое лістападнае рэдкалессе на фералітавых глебах, зах. схілы пласкагор'я і даліны рэк пад вільготнымі трапічнымі лясамі, на ўзбярэжжы — травяністыя і хмызняковыя саванны на чырвона-бурых глебах, на Пд — паўпустыня, якая пераходзіць у пустыню Наміб. Жывёльны свет: сланы, насарогі, буйвалы, зебры, ільвы, леапарды, гіены і інш., у трапічных лясах малпы. Нац. паркі і заказнікі: Кісама, Лванда, Камея, Намібе і інш.

**Насельніцтва**. Каля 96% насельніцтва належыць да народу моўнай сям'і банту (мбунду, конга, авімбунду, баконга, вачакве, ваньянка, авамба і інш.), жывуць партугальцы. Паводле веравызнання каталікі (больш за 80%), пашыраны анімістычныя культы. Сярэдняя шчыльн. 8 чал. на 1 км². Найб. густа заселены нізіны і даліны рэк. Гар. насельніцтва 28,3% (1990). Найб. гарады: Луанда, Уамба, Лабіту, Бенгела, Лубанга і інш.

**Гісторыя**. Першабытная матэрыяльная культура на тэр. А. зарадзілася ў 8-м тыс. да н.э. Яе носьбітамі былі народы, нашчадкамі якіх з'яўляюцца пігмеі кангалезскіх лясоў, бушмены паўд.-зах. пустыняў і кой (гатэнтоты) Паўд. Афрыкі. Каля 3 тыс. гадоў назад сюды з бас. р. Конга і раёна вял. афрыканскіх азёраў перамясціліся негроідныя плямёны моўнай сям'і банту.

Да пач. еўрап. каланізацыі на тэр. А. размяшчаліся раннефеад. дзяржавы Конга, Ндонга, Луанда, Бенгела і інш. Феад. адносіны тут суіснавалі з родаплемяннымі. У канцы 15 ст. на ўзбярэжжа вусця р. Конга высадзіліся партугальцы і залажылі тут апорны пункт Сан-Паўлу-ды-Луанда, які стаў цэнтрам гандлю рабамі. З 16 ст. А. — крыніца таннай рабочай сілы для цукр. плантацый Бразіліі. У 1671 афіцыйна абвешчана ўладаннем Партугаліі, хоць доўгі час яна кантралявала толькі крэпасці і факторыі на ўзбярэжжы. Паводле дагавора 1885—99 Партугаліі з Бельгіяй, Францыяй, Германіяй і Англіяй канчаткова вызначаны межы партуг. калоніі А. За працяглы час гандлю рабамі многія раёны краіны абязлюдзелі, знішчана духоўная і матэрыяльная культура раннефеад. дзяржаў.

З пачатку каланізацыі партугальцы сустрэлі ўпартае супраціўленне афр. плямёнаў. Цэнтрам антыкалан. руху была дзяржава Ндонга, якую партугальцы называлі А. (ад імя правячай дынастыі Нгола). У 17 ст. барацьбу за незалежнасць узначаліла каралева Нзінга Мбандзі Нгола. Прасоўванне партугальцаў у глыб краіны было прыпынена. У канцы 17 — пач. 18 ст. супраціўленне захопнікам у раёне Каконды аказалі плямёны пад кіраўніцтвам Хамба. У 1885 на Пд А. пачалася вызв. барацьба плямёнаў этнічнай групы авамба, якая працягвалася 30 гадоў. У 1956 некалькі падп. груп аб'ядналіся ў *Народны рух за вызваленне Анголы* (МПЛА) пад кіраўніцтвам А.*Нета*. Хоць паўстанне ў Луандзе было задушана, узбр. барацьба ахапіла ўсю краіну. У ёй прынялі ўдзел таксама Нац. саюз за поўную незалежнасць А. (*УНІТА*) і Нац. фронт вызвалення А. (ФНЛА). Да пач. 1970-х г. паўстанцы вызвалілі значную частку А. У ліп. 1972 А. атрымала статус штата з правам мясц. аўтаноміі, але заставалася ў паліт. і эканам. залежнасці ад Партугаліі.

У 1974 Партугалія прызнала права А. на самавызначэнне і незалежнасць. Паводле двухбаковай дамоўленасці ўзбр. барацьба ў краіне спынялася. У створаны ў 1975 пераходны ўрад увайшлі прадстаўнікі МПЛА, УНІТА і ФНЛА. Аднак з-за шматлікіх супярэчнасцяў гэты ўрад распаўся. Супраць новага кабінета, створанага МПЛА, выступіла УНІТА. Узбр. барацьба паміж імі перарасла ў грамадз. вайну. 11.11.1975 у Луандзе абвешчана незалежная Нар. Рэспубліка А., якую прызналі СССР, Куба і інш. краіны. Першым прэзідэнтам стаў А.Нета. Але на тэр. А. ўварваліся войскі ПАР і наёмнікаў. Урад А. папрасіў дапамогі ў Кубы. Нац. ўзбр. сілы А. пры дапамозе кубінскіх ваеннаслужачых да сак. 1976 выцеснілі інтэрвентаў. У 1979 прэзідэнтам краіны стаў Ж.Э. душ Сантуш. Узбр. акцыі супраць А. працягваліся. У 1988 паміж А., Кубай, ПАР і ЗША падпісаны пагадненні, паводле якіх з А. выводзіліся войскі ПАР і Кубы. Але грамадз. вайна не спынілася. 31.5.1991 падпісана пагадненне аб мірным урэгуляванні паміж МПЛА і УНІТА, створана аб'яднаная нац. армія. У вер. 1992 пад наглядам ААН прайшлі парламенцкія і прэзідэнцкія выбары, на якіх перамагла партыя МПЛА. УНІТА адмовілася прызнаць вынікі выбараў, і ваен. дзеянні аднавіліся. У кастр. 1993 УНІТА прызнала вынікі выбараў 1992, у снеж. 1993 паміж урадам і УНІТА падпісана перамір'е.

У А. зарэгістравана каля 30 партый. Асн. з іх: МПЛА, УНІТА, ФНЛА.

**Гаспадарка**. Аснова эканомікі — здабыўная прам-сць і сельская гаспадарка. Валавы ўнутр. прадукт у 1991 склаў 9,1 млрд. дол. (36% прыпадае на нафту і нафтапрадукты). Здабыча нафты (21 млн. т, 1991), алмазаў (961 тыс. карат, 1991). Вытв-сць электраэнергіі (730 млн. кВт · гадз, 1987, 70% на ГЭС). Развіваюцца апрацоўчая прам-сць (перапрацоўка с.-г. сыравіны, металаапр., нафтаперапр., лесапілаванне, тэкст., швейная і інш.), буд. індустрыя (вытв-сць цэменту, азбесту), суднабудаванне. Важная галіна сельскай гаспадаркі — плантацыйнае земляробства. Культывуюць каву (13 тыс. т, 1987), кукурузу, сізаль, цукр. трыснёг, алейную пальму, пшаніцу, какаву, гевею, тытунь і інш. Вырошчваюць бавоўну, маніёк, фасоль, рыс, арахіс. Жывёлагадоўля ў асн. у паўд. раёнах (буйн. раг. жывёла, свінні, козы). Рыбалоўства. Развіты чыг. (каля 3,3 тыс. км) і аўтамаб. (каля 80 тыс. км) транспарт. Марское кабатажнае суднаходства. Гал. парты — Луанда, Лабіту, Кабінда. У Луандзе міжнар. аэрапорт. У экспарце А. 88,9% займае нафта, 7,3% — алмазы. Больш за 90% экспарту паступае ў ЗША, краіны Зах. Еўропы (з 1985 А. асацыіраваны член Еўрап. Саюза), Бразілію. Вывозяцца кава (6 тыс. т, 1991), алмазы, сізаль, кукуруза, пальмавы алей, драўніна. Імпартуюцца машыны, абсталяванне, тэкстыль, металы. У 1989 А. прынята ў Міжнар. валютны фонд і Міжнар. банк рэканструкцыі і развіцця. Грашовая адзінка — кванэа.

**Літаратура**. Багатая вусная л-ра існуе на мовах народаў банту — кімбунду, умбунду, кіконга, гангела і інш. У канцы 19 ст. К. да Мата сабраў і выдаў кн. «Народная мудрасць у ангольскіх прымаўках», А.Рыбаш — кн. казак і прымавак «Місоса» (т. 1—3, 1961—64) і «Ангольскія абрады і божествы» (1958). На аснове нар. легендаў Каштру Сараменью стварыў кн. «Гісторыя Чорнай Зямлі» (т. 1—2, 1960). Пісьмовая л-ра, пераважна на партуг. мове, узнікла ў 19 ст. і мела публіцыст. характар. Літаратуры на мовах кімбунду і умбунду не мелі магчымасці друкавацца. У друку разгарнуўся патрыят. рух за аднаўленне сапраўднай нац. культуры. У 1920—30-я г. асн. жанры — бытапісальныя і дыдактычныя апавяданні. Тэмы нац. самасцвярджэння гал. чынам адлюстроўваюцца ў паэзіі і журналістыцы. З 1930-х г. вядомыя раманы П.Машаду і А.Трані, А. ды Асіс Жуніёр. Пасля 2-й сусв. вайны ўзніклі патрыятычны культ.-асв. рух «Ідзём адкрываць Анголу» (1948), «Культурнае таварыства Анголы» (1952), выдадзены першы кімбунду-партуг. слоўнік (1953). Пад уплывам нац.-вызв. вайны 1961—74 у л-ры актуалізуецца тэма барацьбы супраць каланіялізму і расізму. Вылучаюцца вершы А.Нета, А.Жасінту, А.Барбейтуша, Р.Дуарці ды Карвалью і інш. Антыкаланіяльны кірунак маюць трылогія Каштру Сараменью «Мёртвая зямля» (1949), «Паварот» (1957), «Язва» (1970). Раман Рыбаша «Уанга» (1953) перакладзены на многія еўрап. мовы. Значнае дасягненне прозы — апавяданні і аповесці Л.Віейры. У 1977 створаны Саюз пісьменнікаў А.

**Мастацтва**. На тэр. А. захаваліся першабытныя наскальныя геаметрызаваныя малюнкі жывёл. У сярэдневяковых дзярж. утварэннях (Луанда, Конга) развівалася дэкар.-прыкладное мастацтва, асабліва пляценне і разьба. Планіроўка пасяленняў кругавая: у цэнтры — памяшканне для сходаў, вакол яго — жылыя дамы з гасп. пабудовамі. Жылыя дамы прамавугольнай (радзей круглай) формы на каркасе з калоў, пераплеценых галінкамі, часам абмазаныя глінай, з глінабітнай падлогай, канічнай або 2-схільнай саламянай страхой. Дзверы і сцены часта ўпрыгожваюць разьбяным выпаленым ці маляваным геам. арнаментам. З прыходам еўрапейцаў у А.

Ангола. Эразійны каньён каля г. Луанда.

Сталіца Анголы г. Луанда.

з'явіліся гарады, якія забудоўваліся на ўзор правінцыяльных партуг. гарадоў мураванымі будынкамі ў стылі барока і ранняга класіцызму. З пач. 20 ст. забудова вядзецца ў духу сучаснай еўрап. архітэктуры з выкарыстаннем новых канструкцый і матэрыялаў. Развіта маст. разьба: стылізаваныя, схематычныя статуэткі людзей і жывёл, якія, паводле нар. павер'яў, валодаюць магічнай сілай, рытуальныя маскі. Разьбянымі выявамі (часам са складанымі дэкар. кампазіцыямі) аздабляюць драўляную мэблю, рэчы хатняга ўжытку. Пляцёнкі з галінак і саломы, кошыкі, цыноўкі і інш. вырабы нар. мастацтва ўпрыгожваюць геам. арнаментам чорнага, жоўтага, чырвона-карычневага колеру. З 1970-х г. развіваецца выяўленчае (асабліва графіка) і дэкар.-прыкладное мастацтва.

*Літ.*: Фитуни Л.Л. Народная Республика Ангола: Справ. М., 1985; Хазанов А.М., Притворов А.В. Ангола. М., 1979.

*У.С.Кошалеў* (гісторыя), *М.С.Вайтовіч* (гаспадарка).

Каза ангорскай пароды.

**АНГО́РСКАЯ ПАРО́ДА** козаў, старажытная воўнавая парода. Выведзена ў сярэднявеччы ў Турцыі, у правінцыі Ангора (Анкара). З 19 ст. гадуюць у ЗША, краінах Афрыкі і Аўстраліі, у Закаўказзі, Сярэдняй Азіі, часткова ў Казахстане. Выкарыстоўваюць для паляпшэння грубашэрсных парод козаў. З яе ўдзелам выведзена *савецкая воўнавая парода*.

Жывая маса дарослых казлоў 50—55, матак 32—36 кг. Воўна 44—46-й якасці, даўж. 25 см і больш, аднародная, паўтонкая, белая, з моцным люстраным бляскам. Гадавы настрыг воўны з казлоў 5—7 кг, з матак 2,2—4 кг. Выхад чыстай воўны 65—75%. З ангорскай воўны вырабляюць драпіраваныя тканіны, плюш, дываны, трыкат. вырабы; са шкур — футры. Удой за лактацыю 70—100 кг, тлустасць малака 4,2—4,4%. Пладавітасць 100—110%.

**АНГРЭ́Н**, горад ва Узбекістане, у Ташкенцкай вобл., у даліне р. Ахангаран. Засн. ў 1946. 133 тыс. ж. (1990). Чыг. станцыя. Цэнтр вугальнай прам-сці, ст. падземнай газіфікацыі вугалю. Хім. (азотна-тукавыя ўгнаенні, вытв-сць гумава-тэхн. вырабаў і інш.), харч. прам-сць; вытв-сць буд. матэрыялаў (жалезабетонныя канструкцыі, цэмент,

керамічныя вырабы і інш.). Пед. ін-т. Гіст.-краязнаўчы музей.

**АНГРЭ́НСКАЕ РАДО́ВІШЧА** вугальнае, ва Узбекістане, у даліне р. Ахангаран. Пл. 70 км². Вугляносныя адклады юры. Агульныя геал. запасы да глыб. 600 м — 2,57 млрд. т. Адкрыта ў 1933, распрацоўваецца з 1940. Вугаль буры. Цеплыня згарання 13,9 МДж/кг. Здабыча пераважна адкрытым спосабам. Цэнтр — г. Ангрэн.

**А́НГСТРЭМ** (Ångström) Андэрс Іонас (13.8.1814, г. Лёгдзё, Швецыя — 21.6.1874), шведскі фізік, адзін з заснавальнікаў *спектральнага аналізу*. Скончыў Упсальскі ун-т (1839), дзе працаваў (з 1858 праф., у 1870—71 рэктар). Навук. працы А. па спектральным аналізе, магнетызме, цеплавых з'явах і

Андалузіт.

ўласцівасцях металаў. Вызначыў з вял. дакладнасцю даўжыні хваляў і склаў першы падрабязны атлас спектральных ліній сонечнага спектра. Адкрыў вадарод у сонечнай атмасферы. Імем А. наз. адзінка даўжыні, роўная $10^{-10}$ м.

**АНГУЛЕ́М** (Angoulême), горад на З Францыі, на р. Шаранта. Адм. ц. дэпартамента Шаранта і гал. горад гіст. вобласці *Ангумуа*. Засн. ў перыяд рымскай каланізацыі. 95 тыс. ж. (1982). Машынабудаванне, папяровая, паліграф., фаянсавая, харчасмакавая, ваен. вытв-сць. Арх. помнікі 12—15 ст. (у т.л. сабор Сен-П'ер, 1105—23). Музеі.

**АНГУМУА́** (Angoumois), гістарычная вобласць на З Францыі, дэпартамент Шаранта і часткова Дардонь. Пл. 6,1 тыс. км². Нас. 360 тыс. чал. (1982). Гал. горад — Ангулем. Вінаробства, вытв-сць каньякоў (назва ад г. Каньяк); машынабудаванне, папяровая, ваен. прам-сць.

**АНДАЛІ́Б** Нурмухамед-Гарыб (каля 1712—80), туркменскі паэт. Заснавальнік эпічнага жанру дастана ў туркм. л-ры. Выкарыстоўваючы літ. і фальклор. сюжэты, стварыў рамант. дастаны «Лейлі і Меджнун», «Юсуп і Зулейха». Аўтар паэм «Агуз-намэ», «Несімі», «Жыкыр» («Чыгір»).

**АНДАЛУЗІ́Т** (ад назвы гіст. вобл. Андалусія ў Іспаніі), мінерал падкласа астраўных сілікатаў, алюмасілікат, Al Al [$SiO_4$]O. Крышталізуецца ў рамбічнай сінганіі. Утварае прызматычныя крышталі, слупкаватыя, прамянёвыя агрэгаты і інш. Колер ружовы, шэры, карычневы, жоўты, чырвоны. Бляск шкляны. Цв. 6,5—7,5. Шчыльн. 3,1—3,2 г/см³. А. — характэрны мінерал метамарфічных сланцаў і гнейсаў. Трапляецца таксама ў рагавіках, другасных кварцытах, некаторых пегматытах і россыпах. На Беларусі — як акцэсорны мінерал у палеагенавых і неагенавых адкладах, трапляецца ў крышт. фундаменце, адкладах верхняга пратэразою, карбону, трыясу, мелу, марэнных і алювіяльных. Выкарыстоўваецца як сыравіна для высокагліназемістых вогнетры-

Андаракі з в. Збляны Лідскага раёна Гродзенскай вобл. 1920-я г. (уверсе) і з Брэсцкай вобл. Пач. 20 ст.

валых матэрыялаў і тонкакерамічных (ізалятары і інш.) вырабаў.

**АНДАЛУ́СІЯ**, Андалузія (Andalucía), аўтаномная вобласць на Пд Іспаніі. Пл. 87,3 тыс. км², нас. 6,4 млн. чал. (1993). Адм. цэнтр — г. Севілья. Уключае 8 правінцый: Альмерыя, Гранада, Кадыс, Кордава, Малага, Севілья, Уэльва, Хаэн. Найб. гарады: Севілья, Малага, Кордава, Гранада, Кадыс, Уэльва. Займае б. ч. Андалускай нізіны ў бас. р. Гвадалквівір на ўзбярэжжы Атлантычнага ак. і Міжземнага мора. На Пн горы Сьера-Марэна, на Пд Андалускія. Клімат міжземнаморскі, вільготны на ПдЗ (да 2000 мм ападкаў за год), засушлівы на ПдУ (120 мм за год, найменш у Зах. Еўропе). Т-ра студз. 6—14,5 °С, жн. 23—28 °С.

Найстараж. насельнікі А. — іберы. Тут існавалі калоніі фінікійцаў, пазней — карфагенян. У перыяд рым. панавання А. ўваходзіла ў склад правінцыі Бетыка. Арабы, якія заваявалі на пач. 8 ст. большую ч. Пірэнейскага п-ва, пашырылі назву А. (аль-Андалус) на ўсю тэр. мусульм. Іспаніі. У ходзе *Рэканкісты* ў 13 ст. А. (акрамя Гранадскага эмірата) адваявана ў арабаў. З адваяваннем Гранадскага эмірата (1492) А. цалкам стала ч.Ісп. каралеўства.

Эканоміка агр.-прамысловая. У с.-г. вытв-сці занята каля 42% насельніцтва. Пераважае арашальнае земляробства. 1-е месца ў краіне па зборы бабовых, цукр. трыснягу, бавоўніку, сланечніку, 2-е — па зборы збожжавых (пшаніца, рыс, сорга). Вырошчваюць гародніну, бахчавыя, алівы, вінаград, тытунь, бульбу, цукр. буракі і інш. Жывёлагадоўля — авечкі, коні, буйн. раг. жывёла, у т.л. быкі для карыды. Развіты рыбалоўства, збор кары коркавага дрэва. Здабываюць медзь, свінец, цынк, марганец, жал. руду, вугаль, серу. Асн. галіны прам-сці: каляровая металургія, хім., маш.-буд. (с.-г. машыны, суднабудаванне), нафтаперапр., нафтахім., харчасмакавая, тэкстыльная. А. — буйны экспарцёр аліўкавага алею, кансерваваных маслін, віна. Раён турызму, вядомыя курорты на Сонечным беразе.

*Ф.С.Фешчанка* (прырода, гаспадарка).

**АНДАЛУ́СКАЯ НІЗІ́НА**, на Пд Пірэнейскага п-ва, у Іспаніі, паміж гарамі Андалускімі і Сьера-Марэна, у бас. р. Гвадалквівір. Даўж. каля 300 км. Займае перадгорны прагін, запоўнены кайназойскімі адкладамі. Густа населена. Клімат міжземнаморскі, ападкаў 400—700 мм за год. Зараснікі маквісу, пальміту, гарыгі. Пасевы збожжавых, цукр. буракоў; гаі цытрусавых, аліўкавых дрэў, сады, вінаграднікі. Буйныя гарады Севілья, Кордава, Кадыс.

**АНДАЛУ́СКІЯ ГО́РЫ**, Кардыльера-Бетыка (Cordillera Betica), горная сістэма на Пд Пірэнейскага п-ва ў Іспаніі. Працягласць з ПдЗ на ПнУ каля 630 км. Выш. да 3478 м (г. Муласен). Утвораны некалькімі глыбока расчлянёнымі хрыбтамі і масівамі альпійскага ўзросту. Складзены пераважна з крышт. парод і вапнякоў. Развіты карст. Радовішчы жал. руды. Укрытыя лістападнымі і вечназялёнымі лясамі і хмызнякамі. У катлавінах і на ўзбярэжжы плантацыі цытрусавых, аліўкаў, вінаграднікі, на У — фінікавыя пальмы.

**АНДАМА́НСКАЕ МО́РА**, паўзамкнёнае мора Індыйскага ак., паміж п-вамі Індакітай і Малака, в-вам Суматра, ланцугом Нікабарскіх і Андаманскіх

а-воў. Абмывае берагі М'янмы, Тайланда, Інданезіі і сумежных астравоў Індыі. Пл. 605 тыс. км². Найб. глыб. 4507 м. Клімат трапічны, вільготны, мусонны. Сярэдняя т-ра вады ў люг. 26 °С, у жн. 28 °С. Салёнасць ад 20—25 °/₀₀ на Пн да 30—35 °/₀₀ на Пд. Прылівы паўсутачныя (да 7,2 м). Фауна: дэльфіны Іравадзі, дзюгоні, лятучыя рыбы, рыфавыя рыбы, парусні́кі і інш. Рыбалоўства. Асн. парты: Янгон, Малам'яйн (М'янма), Пхукет (Тайланд), Джорджтаўн, Келанг (Малайзія), Белаван (Інданезія).

*А.М.Вітчанка.*

**АНДАМА́НСКІЯ АСТРАВЫ́**, архіпелаг на Пн Індыйскага ак. паміж Бенгальскім зал. і Андаманскім морам. Працягласць з Пн на Пд 350 км. Частка саюзнай тэр. Індыі (*Андаманскія і Нікабарскія астравы*). Пл. 6,5 тыс. км². Самыя вял. а-вы: Паўн. Андаман, Сярэдні Андаман, Паўд. Андаман, М. Андаман. А.а. — вяршыні падводнага горнага ланцуга на прадаўжэнні хр. Ракхайн (з вулканамі Барэн і Наркандам), месцамі акаймаваны рыфамі. Нізкагорны расчлянёны рэльеф, выш. да 732 м (г. Садл-Пік). Клімат трапічны, мусонны. Вільготныя вечназялёныя трапічныя лясы. Адзіны горад — Порт-Блэр.

**АНДАМА́НСКІЯ І НІКАБА́РСКІЯ АСТРАВЫ́** (англ. Andaman and Nicobar Islands), саюзная тэрыторыя Індыі, на аднайменных а-вах паміж Бенгальскім зал. і Андаманскім м. Працягласць з Пн на Пд 750 км. Пл. 8,3 тыс. км². Нас. 278 тыс. чал. (1991). Адм. цэнтр — г. Порт-Блэр. Лесараспрацоўкі. Вырошчванне какосавай і каўчукавай пальмаў, рысу, садавіны. Рыбалоўства (лоў крэветак, трэпангаў), збіранне ракавін. Экспарт драўніны. Аб прыродзе гл. ў арт. *Андаманскія астравы*, *Нікабарскія астравы*.

**АНДАРА́К**, паясное жаночае адзенне, спадніца з шарсцяной ці паўшарсцяной саматканкі. Вядомы па ўсёй Беларусі за выключэннем паўн.-зах. раёнаў. Шылі з 3—5 полак. Малюнак (у клетку або ў падоўжныя ці ў папярочныя палосы) утвараўся на вохрыста-ружовым, вішнёвым, сінім, зялёным, серабрыста-белым, чорным фоне тканіны. Дадатковымі элементамі дэкору служылі запрасаваныя складкі, вышыўка, карункавыя тасёмкі, стужкі. У 19 — пач. 20 ст. найб. пашыраныя былі клятчастыя А. (чырвона-чорныя клеткі па ўсім полі — *ваўкавыска-камянецкі строй*). Паступова да чорнага і чырвонага колераў пачалі дадаваць зялёны, ружовы, жоўты і інш. У паўд.-зах. і цэнтр. раёнах Беларусі пераважалі А. ў папярочныя палосы (*ляхавіцкі строй*, *пухавіцкі строй*), ва ўсх. — у падоўжныя (шырокія чырвоныя чаргаваліся з вузейшымі белымі). З пач. 20 ст. пашыраны аднатонныя чырвоныя, сінія і інш. А. Святочныя А. абавязкова гафрыравалі. Выйшаў з ужытку ў 1930-я г.

**АНДА́ТРА**, мускусны пацук (Ondatra zibethicus), млекакормячая паўводная жывёла атр. грызуноў. Пашырана ў Паўн. Амерыцы, Еўразіі. Радзіма — Паўн. Амерыка. У 1905 завезена ў Зах. Еўропу. На Беларусь пранікла з Польшчы. Шырока рассялілася. Жыве ў норах, «хатках» у старыцах, невял. з павольным цячэннем рэчках, каналах, азёрах, сажалках, багатых воднай і прыбярэжнай расліннасцю.

Даўж. цела да 40 см, хваста да 35 см, маса да 2 кг. Поўсць густая, шаўкавістая, ад светла-карычневай да чорнай. Хвост з бакоў пляскаты, укрыты рагавымі лускавінкамі. У самцоў у перыяд гону залозы выдзяляюць сакрэт з мускусам. Корміцца раслінамі. За год дае да 3 прыплодаў па 3—15 дзіцянят. Аб'ект промыслу (футра, мяса).

**АНДГУЛА́ДЗЕ** Давід Ясонавіч (15.10.1895, с. Бахві, Махарадзеўскі р-н, Грузія — 29.9.1973), грузінскі спявак (драм. тэнар). Нар. арт. СССР (1950).

Андатра.

Скончыў Тбіліскую кансерваторыю (1927), з 1958 яе прафесар. У 1929—55 саліст т-ра оперы і балета імя Паліяшвілі (Тбілісі). Сярод партый: Тарыэл («Паданне пра Тарыэла» Ш.Мшвелідзе, Дзярж. прэмія СССР 1947), Герман («Пікавая дама» П.Чайкоўскага), Атэла, Радамес («Атэла», «Аіда» Дж.Вердзі). Дзярж. прэмія Грузіі 1973.

Фра Анджэліка. Мадонна на троне паміж святымі Кацярынай і Даменікам. 1445.

**АНДЖАЕ́ЎСКІ** (Andrzejewski) Ежы (19.8.1909, Варшава — 19.4.1983), польскі празаік і публіцыст. У 1927—31 вучыўся ў Варшаўскім ун-це. Першае апавяданне «Хлусня» (1932). Вядомасць прынесла аповесць «Лад сэрца» (1938). У зб. апавяд. «Ноч» (1945) адлюстраваў жыццё суайчыннікаў у час ням. акупацыі. Раман «Попел і дыямент» (1948; экранізацыя А.Вайды, 1958) пра супярэчлівую грамадска-паліт. і маральную атмасферу ў пасляваеннай Польшчы. У метафарычных аповесцях «Цемра ахінае зямлю» (1957), «Брама раю» (1960) праблемы быцця чалавека ў складаны гіст. плыні часу, пошукі справядлівасці, веры, сэнсу існавання. У аповесці «Ужо амаль нічога» (1976) даследуе душэўны стан і памкненні мастака, у аповесці «Ніхто» (1983) праз міфалагічную прызму спрабуе асэнсаваць месца і прызначэнне чалавека ў Сусвеце. Яго творам уласцівы філасафічнасць, нетрадыцыйнае светаўспрамыенне, экзістэнцыяльная праблематыка.

*Тв.*: Popiół i diament. Warszawa, 1964; Trzy opowieści: Ciemności kryją ziemię. Bramy raju. Idzie skacząc po górach. Warszawa, 1973: Nikt. Warszawa, 1987; Рус. пер. — Сочинения. Т. 1—2. М., 1990.

*М.М.Хмяльніцкі.*

**АНДЖАЛІ́НІ** (Angiolini) Даменіка Марыа Гаспара (9.2.1731, Фларэнцыя — 5.2.1803), італьянскі балетмайстар, артыст, лібрэтыст і кампазітар. Адзін з заснавальнікаў дзейснага балета. Падзяляў балетныя жанры на 4 групы: гратэск, камічны, паўхарактарны і высокі. Важнейшае месца ў балеце адводзіў музыцы. На аснове камедый Мальера стварыў новае для муз. т-ра відовішча. Працаваў у Італіі, Германіі, Аўстрыі, у 1766—86 (з перапынкамі) у Пецярбургу і Маскве. Паставіў шэраг балетаў, у т.л. на ўласную музыку.

**АНДЖАПАРЫ́ДЗЕ** Верыко (Вера Іўліянаўна; 6.10.1900, Кутаісі — 30.1.1987), грузінская актрыса. Нар. арт. СССР (1950). Герой Сац. Працы (1979). Вучылася ў драм. студыях у Маскве і Тбілісі. Працавала ў Тбілісі ў груз. т-ры імя Руставелі (з 1920), з 1928 — у т-ры імя К.Марджанішвілі. Актрыса вял. сцэн. культуры, яркай індывідуальнасці, развівала рамантычныя традыцыі груз. т-ра. Лепшыя ролі: Джавара («Выгнаннік» В.Пшавелы), Марыя Сцюарт (аднайм. п'еса Ф.Шылера), Клеапатра («Антоній і Клеапатра» У.Шэкспіра). Здымалася ў кіно. Дзярж. прэміі СССР 1943, 1946, 1952.

**АНДЖАПАРЫ́ДЗЕ** Зураб Іванавіч (н. 12.4.1928, Кутаісі), грузінскі спявак (лірыка-драм. тэнар). Нар. арт. СССР (1966). Скончыў Тбіліскую кансерва-

рыю (1952), з 1971 выкладае ў ёй (праф. з 1984). У 1952—59 і з 1970 саліст Т-ра оперы і балета імя Паліяшвілі (Тбілісі), у 1959—70 — Вял. т-ра. Сярод лепшых партый: Абесалом («Абесалом і Этэры» З.Паліяшвілі), Міндыя («Міндыя» А.Такташвілі), Герман («Пікавая дама» П.Чайкоўскага), Хазэ («Кармэн» Ж.Бізэ). Дзярж. прэмія Грузіі 1971.

**АНДЖЭ́ЛІКА,** Фра Анджэліка, Беата Анджэліка (Angèlico, Fra Angelico, Beato Angèlico; сапр. Гвіда ды П'етра; Guido di Pietro; каля 1400, г. Вік'ё, прав. Фларэнцыя, Італія — 18.2.1455), італьянскі жывапісец эпохі Ранняга Адраджэння. Прадстаўнік *фларэнцінскай школы*. Як мастак склаўся пад уплывам познагатычнага жывапісу, у далейшым выкарыстаў рэалізм *Мазачыо*. Наіўнае і глыбока рэліг. мастацтва А. прасякнута светлым лірызмам і мяккай паэтычнасцю: «Каранацыя Марыі» (каля 1434—35); фрэскі б. манастыра Сан-Марка ў Фларэнцыі (1438—45), «Мадонна на троне паміж святымі Кацярынай і Даменікам» (1445), капэлы Мікалая V у Ватыкане (1445—48) і інш.

**АНДО́РА** (каталанскае, ісп. Andorra, франц. Andorre), Княства Андора (каталанскае Principat d'Andorra, ісп. Principado de'Andorra, франц. Principauté d'Andorre), дзяржава на ПдЗ Еўропы ва ўсх. Пірэнеях паміж Іспаніяй і Францыяй. Пл. 465 км², нас. 64 тыс. чал. (1993). Сталіца — г. *Андорала-Вела*. Афіц. мова каталанская, выкарыстоўваецца таксама ісп. і французская. Насельніцтва: іспанцы (61%), андорцы (30%), французы (6%) і інш. Большасць вернікаў — католікі. Сярэдняя шчыльн. насельніцтва 137 чал. на 1 км². У адм.-тэр. адносінах А. падзяляецца на 7 абшчын. Афіцыйна А. — суверэннае парламенцкае княства, фактычна — рэспубліка. Заканадаўчы орган — аднапалатны Ген. савет, які выбіраецца ўсеаг. прамым галасаваннем на 4 гады. Выканаўчую ўладу ажыццяўляе Выканаўчы савет (урад) з 5 міністраў. Узбр. сіл не мае. Існуюць невял. паліцэйскія фарміраванні для аховы грамадскага парадку.

**Прырода.** Размешчана на паўд. схілах Пірэнеяў у даліне р. Валіра і яе прытокаў (бас. р. Эбра), акружанай гарамі выш. 800—2942 м. Шмат азёраў ледавіковага паходжання. Сярэднія т-ры студз. ў гарах -15 °С, у даліне Валіры і на Пд А. -2 °С, ліп. — да 20 °С, ападкаў 1000—2000 мм за год. Частыя засухі. Па схілах гор шыракалістыя (дуб, граб, бук, каштан; займаюць 30% тэр.) і ялова-піхтавыя лясы, вышэй — субальпійскія і альпійскія лугі. Карысныя выкапні: свінцовыя, жал. і сярэбраныя руды, шыферныя сланцы, каштоўныя і вырабныя камяні, ёсць мінер. воды.

**Гісторыя.** Першае ўпамінанне ў крыніцах адносіцца да 805. У сярэднія вякі тэр. А. — феад. ўладанне ў асн. графаў дэ Фуа і епіскапаў Урхельскіх; паводле пагаднення 1278 іх сумесны сюзерэнат. Пазней правы графаў дэ Фуа перайшлі да франц. каралёў. З 1419 дзейнічае Ген. савет — найстарэйшы (пасля ісландскага) парламент у Еўропе. У 1866 уведзена канстытуцыя, з 1867 улада епіскапа абмежавана. У жыцці і звычаях народа А. захоўваюцца перажыткі дафеад. і феад. адносін (абшчынная ўласнасць на зямлю, звычаёвае права і інш.). У 1933 уведзена ўсеагульнае выбарчае права для мужчын, у 1970 — і для жанчын. У 1981 падпісаны дэкрэт аб «рэформе інстытутаў» (раздзяленні ўлады), якім прадугледжана акрамя Ген. савета стварэнне Выканаўчага савета. Пасля парламенцкіх выбараў у 1992 Ген. савет і ўрад узначаліў лідэр рэфармістаў О. Рыба-Рэйг. На рэферэндуме ў сак. 1993 прынята новая канстытуцыя. 2.6.1993 падпісаны дагаворы аб добрасуседстве, дружбе і супрацоўніцтве з Францыяй і Іспаніяй, якія першыя прызналі суверэнітэт А. Да гэтага моманту, знаходзячыся пад двайным пратэктаратам Францыі і епіскапа Урхельскага, А. плаціла ім абодвум сімвалічную даніну грашамі і натурай. Паліт. партыі: Саюз і прагрэс, Дэмакр. саюз і інш.

**Гаспадарка.** Аснова эканомікі — абслугоўванне турыстаў (больш за 10 млн. чал. штогод, 250 атэляў). Развіты лячэбна-аздараўленчы і горны турызм (асабліва лыжны). Бальнеалагічны цэнтр А. — г. Лес-Эскальдэс. Валавы ўнутр. прадукт — 760 млн. дол. (1992). Прадпрыемствы харчасмакавай (у т.л. тытунёвай), лёгкай прам-сці. ГЭС магутнасцю 26,5 МВт. Развіты саматужныя і дапаможныя промыслы — выраб сувеніраў, вытв-сць драўнянага вугалю, лесанарыхтоўкі. У сельскай гаспадарцы спалучаюцца пашавая жывёлагадоўля і земляробства. Разводзяць авечак (больш



Герб і сцяг Андоры.

Горная вёска ў Андоры.

за 25 тыс. галоў). Пад с.-г. культурамі 4% тэр. краіны. Вырошчваюць ячмень, жыта, кукурузу, бульбу, агародніну, тытунь (20% пасяўной пл.), вінаград, аліўкавыя дрэвы. Транспарт аўтамабільны, аўтамагістралі злучаюць А. з Іспаніяй і Францыяй. Экспарт: электраэнергія, свінцовая руда, воўна, аўчыны, тытунь, соль, керамічныя вырабы, драўняны вугаль. Імпарт: прамысл. і харч. тавары. Гал. знешнегандлёвыя партнёры — Францыя, Іспанія і Вялікабрытанія. А. — міжнар. фінансавы цэнтр. Грашовыя адзінкі — франц. франк і ісп. песета. *Ю.В.Ляшковіч* (прырода, гаспадарка).

**АНДО́РА-ЛА-ВЕ́ЛА** (Andorra la Vella), Андора, горад, сталіца *Андоры*. 20 тыс. ж. (1990). У Пірэнеях, самая высакагорная сталіца ў Еўропе (1055 м над узр. м.), размешчана ў даліне р. Валіра. Вытв-сць тытунёвых вырабаў, сувеніраў. Турызм. Транспартны пункт на аўтамагістралі, якая злучае Іспанію і Францыю. Помнік архітэктуры «Дом Далін» (1580) — рэзідэнцыя ўрада.

**АНДРАГЕНЕ́З** [ад грэч. anēr (andros) мужчына + *...генез*], мадыфікацыя палавога размнажэння, пры якой новы арганізм развіваецца ў адпаведнасці толькі з генетычным матэрыялам сперматазоіду; разнавіднасць *партэнагенезу*. Пры А. мацярынскае ядро гіне яшчэ да пранікнення сперматазоіду у клетку і ўзнікае гаплоідны арганізм з храмасомным наборам бацькоўскай формы (наз. андрагенетычным). Звычайны ў кукурузы, некаторых відаў тытуню, эксперыментальна атрыманы ў шаўкапрада, наезнікаў. Штучнае атрыманне жыццяздольных зародкаў магчыма пры аднаўленні дыплоіднага набору храмасом, калі ў яйцаклетку пранікае адначасова некалькі сперматазоідаў і зліваюцца 2 бацькоўскія гаплоідныя ядры. У доследах А. выкарыстоўваецца для вывучэння магчымасцяў кіравання полам пры неабходнасці атрымаць толькі мужчынскае патомства.

**АНДРАГЕ́НЫ** [ад грэч. anēr (andros) мужчына + *ген*(ы)], мужчынскія *палавыя гармоны* пазваночных. Складаюцца з вытворных халестэрыну — тэстастэрону і андрастэрону. Па хім. будове — *стэроіды*.

У мужчынскім арганізме ўтвараюцца семяннікамі і коркавым слоем наднырачнікаў, у жаночым — коркавым слоем наднырачнікаў і часткова яечнікамі. Забяспечваюць развіццё мужчынскіх палавых органаў, другасных палавых адзнак, мышачнай сістэмы, ствараюць станоўчы баланс бялкоў. Утварэнне А. залежыць ад ганадатропнай функцыі гіпофіза, якая кантралюецца ц.н.с. Выкарыстоўваюць у медыцыне пры парушэннях палавой функцыі, у клімактэрычны перыяд, таксама ў жывёлагадоўлі. А. знойдзены ў ганадах многіх беспазваночных і ў насенні некаторых раслін.

**АНДРАДЫ́Т**, мінерал групы *гранатаў*, $Ca_3Fe_2[SiO_4]_3$. Крышталізуецца ў кубічнай сінганіі. Утварае крышталі, зярністыя масы. Колер жоўты, зялёны, чырванавата- або жаўтавата-карычневы, карычневы або чорны. Бляск шкляны, алмазападобны. Цв. 6—7,5. Шчыльн. 3,86 г/см$^3$. Кантактна-метасаматычнага паходжання. Тыповы мінерал вапняковых метамарфізаваных асадкавых парод, скарнаў, вулканічных парод і россыпаў. Абразіўны матэрыял.

**АНДРАЕ́ВІЧ-КУН** (Andrejević-Kun) Джорджа (31.3.1904, г. Вроцлаў — 17.1.1964), сербскі жывапісец і графік. Вучыўся ў Бялградзе (1920—25), Венецыі, Рыме і Парыжы. Заснавальнік сац.-крытычнага кірунку ў сербскім мастацтве 1930-х г. Удзельнік грамадз. вайны ў Іспаніі 1936—39, у 1941—45 — нац.-вызв. барацьбы ў Югаславіі. Аўтар станковых кампазіцый «Маці» (1937), «Калона» (1946), «У Парыжы» (1950), цыкла гравюр па дрэве «Крывавае золата» (1934), «За свабоду» (1937) і інш.

**АНДРАЙКЕ́ВІЧ** Ян Андрэй Гінтоўскі (1599 ці 1609—1674), бел. і польскі пісьменнік, педагог, царкоўны дзеяч. Са шляхецкага роду Андрайкевічаў герба «Побуг» Ваўкавыскага пав. Быў рэктарам Полацкага езуіцкага калегіума. Аўтар «Мемарыяла бессмяротнай памяці...» (Вільня, 1667), дзе змешчаны партрэты і гербы Сапегаў, а таксама твора «Гарчычнае зерне горкай пакуты... Хрыста...» (Вільня, 1673), перавыдадзенага ў Вільні (1688, 1757), Замосці (1701), Калішы (1746, 1756), Кракаве (1881); у 1719 перакладзены на ням. мову. *У.Г.Кароткі.*

**АНДРАЙКО́ВІЧ** (Бутаўт-Андрайковіч) Стафан Аляксандравіч (1861, Гродзенская губ. — ?), рэвалюцыянер. Вучыўся ў Гродзенскай, Віцебскай і 2-й Пецярбургскай гімназіях. З 1881 чл. рэв. групы ў Пецярбургу. Пасля яе ўваходжання ў 1883 на правах рабочай групы партыі «Народная воля» ў Пецярбургскую нарадавольніцкую арг-цыю загадваў (пад псеўд. Уладзімір Бажэнаў) «лятучай друкарняй». Быў звязаны з пецярбургскім гуртком «Агніска» («Ognisko») — філіялам польск. рабочай партыі «Пралетарыят». У 1883 арыштаваны, сасланы на 5 гадоў ва Усх. Сібір. У 1899 жыў у Гродне.

Андрадыт.

**АНДРАМА́ХА**, у грэчаскай міфалогіі жонка *Гектара*. Пасля гібелі мужа, узяцця Троі і падзелу здабычы ахейцамі А. дасталася сыну Ахіла Неапталему, якому нарадзіла 3 сыноў. Пасля яго смерці стала жонкай Гелена, брата Гектара. Да міфа аб А. звярталіся ў л-ры Гамер, Эўрыпід, Ж.Расін, у жывапісе Дж.Цьепала, Ж.Давід і інш.

Да арт. **Андрамаха.** Андрамаха каля цела Гектара. Маст. Ж.Давід. 1783.

Дж.**Андраевіч-Кун.** Пахаванне. З цыкла гравюр па дрэве «Крывавае золата». 1934.

**АНДРАМЕ́ДА**, у грэчаскай міфалогіі дачка эфіопскага цара Кефея і Касіяпеі. Калі *Пасейдон* з *нерэідамі* наслалі на Эфіопію пачвару і навадненне, бацька прынёс А. ў ахвяру. *Персей* забіў пачвару, выратаваў А. і ажаніўся з ёю. Пасля яны ператварыліся ў сузор'і. Тэма выратавання А. адлюстравана ў л-ры (Лопэ дэ Вэга, Г.Сакс, П.Кальдэрон) і выяўл. мастацтве (малюнкі на ант. вазах, фрэскі ў Пампеі, палотны Тыцыяна, Рубенса, Рэмбранта і інш.).

Персей і **Андрамеда.** Фрэска з дома Дыяскураў у Пампеях. 65—70 н. э.

**АНДРАМЕ́ДА** (лац. Andromeda), сузор'е Паўн. паўшар'я. У А. 3 зоркі 2-й зорнай велічыні і спіральная галактыка (гл. *Андрамеды туманнасць*). Найлепшыя ўмовы бачнасці ў вер.—кастрычніку. Гл. таксама *Зорнае неба*.

**АНДРАМЕ́ДА**, кветкавая расліна, гл. *Імшарніца*.

С.А.Андраюк.

**АНДРАМЕ́ДЫ ТУМА́ННАСЦЬ**, найбліжэйшая да нашай Галактыкі гіганцкая спіральная галактыка, самая яркая ў Паўн. паўшар'і неба. Маса (3—5)·$10^{11}$ масаў Сонца, адлегласць ад Зямлі 700 кпк. Бачна простым вокам (як туманная «плямка») у сузор'і Андрамеды. Зоркавая прырода А.т. выяўлена ў 1925.

**АНДРАМЕДЫ́ДЫ**, біэліды, метэорны паток з радыянтам у сузор'і Андрамеды. Звязаны з распадам *Біэлы кометы*. У 1741, 1872 і 1885 назіраліся метэорныя дажджы А. У выніку ўздзеяння Юпітэра на арбіту А. у 20 ст. колькасць метэарытаў у патоку значна зменшылася.

**АНДРАСТЭРО́Н**, мужчынскі палавы гармон (*андраген*). Асн. прадукт метабалізму *тэстастэрону*, падобны да яго біял. дзеяннем — здольны выклікаць узмацненне або ўзнікненне другасных палавых адзнак у пазваночных жывёл і чалавека. У значнай колькасці выводзіцца з мачой. Гарманальная актыўнасць А. прыкладна ў 10 разоў слабейшая, чым тэстастэрону; выкарыстоўваецца ў медыцыне для ацэнкі ўзроўню прадукцыі андрагенаў у арганізме і пакладзена ў аснову колькаснай ацэнкі біял. дзеяння мужч. палавых гармонаў.

**АНДРАЦЭ́Й** [ад грэч. anēr (andros) мужчына + oikia жыллё], сукупнасць мужчынскіх органаў кветкі — *тычынак*.

**АНДРАЮ́К** Нестар Ільіч (парт. псеўд. Мядзведзеў, Алёша; 12.10.1906, в. Сычы Брэсцкага р-на — 2.3.1976), удзельнік рэв. і нац.-вызв. руху ў Зах. Беларусі. З 1926 сакратар Гродзенскага акр. к-та КСМЗБ, з 1927 чл. сакратарыята ЦК КСМЗБ. За рэв. дзейнасць у 1928 зняволены на 8 гадоў. У 1938—39 палітвязень Бяроза-Картузскага канцлагера. У вер. 1939 арганізоўваў у Пінску паўстанцкія атрады. У Вял. Айч. вайну з 1941 на Цэнтр. фронце ў знішчальнай авіяцыі. У 1947—53 на гасп. і сав. рабоце ў Брэсце.

**АНДРАЮ́К** Серафім Антонавіч (н. 10.3.1933, в. Градзялі Беластоцкага ваяв., Польшча), бел. крытык і літаратуразнавец. Канд. філал. н. (1966). Скончыў БДУ (1957). Настаўнічаў. З 1966 у Ін-це л-ры АН Беларусі. З 1981 гал. рэдактар, з 1993 дырэктар выд-ва «Мастацкая літаратура». Даследуе сучасную бел. прозу: манаграфіі і зб-кі крытычных арт. «Жыццё. Літаратура. Героі» (1973), «Вывяраючы жыццём» (1976), «Традыцыі і сучаснасць» (1981), «Жыць чалавекам» (1983, Літ. прэмія СП Беларусі імя І.Мележа 1984), «Чалавек на зямлі: Нарыс творчасці І.Пташнікава» (1988).

*Тв.*: А жыццё — вышэй за ўсё: Выбр.: Літ.-крытыч. арт.; Нарыс творчасці. Мн., 1992.

**АНДРАЯ́НАВА** Алена Іванаўна (13.7.1819 — 26.10.1857), руская балерына. Скончыла Пецярбургскае тэатр. вучылішча (1837). Да 1854 у Пецярбургскай балетнай трупе. Прадстаўніца рамант. балета. Выкананне А. вызначалася віртуознасцю класічнага і характарнага танцаў, пантамімнай выразнасцю, тэмпераментам, дасканаласцю пластыкі. Першая рус. выканальніца партый Жызэлі («Жызэль» А.Адана), Пахіты («Пахіта» Э.Дэльдэвеза) і інш.

**АНДРО́НАЎ** Аляксандр Аляксандравіч (11.4.1901, Масква — 31.10.1952), савецкі фізік, стваральнік навук. школы па тэорыі нелінейных ваганняў. Акад. АН СССР (1946). Скончыў Маскоўскі ун-т (1925). Праф. Горкаўскага ун-та (1931). Першы прапанаваў матэм. апарат для тэорыі нелінейных ваганняў. Стварыў асновы тэорыі аўтаваганняў. Вырашыў шэраг важных нелінейных задач тэорыі радыётэхнікі, аўтам. рэгулявання і агульнай дынамікі машын.

*Тв.*: Собрание трудов. М., 1956.

**АНДРО́НАЎСКАЯ КУЛЬТУ́РА**, археалагічная культура бронзавага веку (каля сярэдзіны 2 — пач. 1-га тыс. да н.э.) на тэр. Зах. Сібіры і Казахстана. Назва ад могільніка каля в. Андронава (Краснаярскі край). Насельніцтва займалася пераважна жывёлагадоўляй, жыло ў паўзямлянкавых і наземных жытлах на адкрытых паселішчах, карысталася бронзавай зброяй (кельты, наканечнікі коп'яў, нажы), крамянёвымі наканечнікамі стрэл. Пахаванні ў ямах пад курганамі (часам з каменнымі агароджамі) у скурчаным становішчы, вядомы выпадкі трупаспалення. Характэрны керамічны посуд слоікападобнай формы з геам. арнаментам. А.к. разглядаецца як умоўная назва т.зв. андронаўскай культурнай агульнасці — некалькіх археал. культур.

**АНДРО́НІК I** (Andronikos) Камнін (1118—12.8.1185), візантыйскі імператар з 1183, апошні з дынастыі Камнінаў. Захапіў прастол, скарыстаўшы нар. рух. Імкнучыся ўмацаваць бюракратычны апарат і знішчыць карупцыю, праводзіў палітыку тэрору супраць арыстакратыі. Пакараны смерцю.

**АНДРО́НІКАЎ** (Андроніка-швілі) Іраклій Луарсабавіч (28.9.1908, С.-Пецярбург — 11.6.1990), рускі пісьменнік, літаратуразнавец. Засл. дз. маст. РСФСР (1959). Д-р філал. н. (1956). У літ.-знаўчых працах даследаваў творчасць М.Ю.Лермантава. У напаўбелетрыстычных творах («Загадка Н.Ф.І.», 1938; «Тагільская знаходка», 1956, і інш.) расказваў пра архіўныя і тэксталагічныя пошукі. Выступаў з ула-




Сузор'е Андрамеды.

снымі вуснымі апавяданнямі, у якіх стварaў партрэты пісьменнікаў, артыстаў. Дзярж. прэмія СССР 1967.

*Тв.*: Собр. соч. Т. 1—3. М., 1980—81.

**АНДРО́НІКАЎ МАНАСТЫ́Р**, Андронікаў Спаса Нерукатворнага мужчынскі манастыр. Засн. каля 1360 у Маскве на беразе р. Яўза. Названы ў гонар першага ігумена — Андроніка. Арх. ансамбль уключае белакаменны 4-слуповы Спаскі сабор (1420—27) з фрагментамі фрэсак (1420-я г.), выкананых пад кіраўніцтвам Д.Чорнага і А.Рублёва, аднаслуповую трапезную (1504) з царквою Міхаіла Архангела (1694), сцены і вежы (17 ст.). З 1947 — музей-запаведнік стараж.-рус. мастацтва імя А.Рублёва.

**АНДРО́ПАЎ** Юрый Уладзіміравіч (15.6.1914, станіца Нагуцкая Стаўрапольскага краю — 9.2.1984), савецкі парт. і дзярж. дзеяч. Ген. арміі (1976). Герой Сац. Працы (1974). З 1944 на парт. рабоце ў Карэліі. З 1953 пасол СССР у Венгрыі, з 1957 заг. аддзела, у 1962—67 і з мая 1982 сакратар ЦК КПСС. У 1967—82 старшыня КДБ СССР. З ліст. 1982 Ген. сакратар ЦК КПСС, адначасова з чэрв. 1983 Старшыня Прэзідыума Вярх. Савета СССР. Чл. Палітбюро ЦК КПСС з 1973. Дэп. Вярх. Савета СССР у 1950—54 і з 1962.

**АНДРО́САЎСКАЕ ПЕРАМІ́Р'Е 1667**. Падпісана паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай 9 лют. ў в. Андросава (Андрусава; на мяжы Мсціслаўскага і Смаленскага ваяв.) тэрмінам на 13,5 года; закончыла *вайну Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67*. Паводле дагавора да Расіі перайшлі Смаленскае ваяв. з гарадамі Дарагабуж, Белая, Красны, Невель, Веліж і Себеж і Северская зямля з Чарнігавам і Старадубам. Рэч Паспалітая прызнала далучэнне Левабярэжнай Украіны да Расіі і згадзілася на перадачу Расіі Кіева да 1669 (не быў вернуты Рэчы Паспалітай). Запарожская Сеч апынулася пад агульным кіраўніцтвам абедзвюх дзяржаў. Беларусь і Правабярэжная Украіна засталіся ў межах Рэчы Паспалітай, іх насельніцтву гарантавалася свабода правасл. веравызнання і недатыкальнасць праваслаўных епархій. А.п. стала пачаткам саюзу Расіі і Рэчы Паспалітай супраць Турцыі і Крымскага ханства.

**АНДРО́СІК** Мікалай Мікалаевіч (н. 8.1.1945, в. Каменка Нясвіжскага р-на Мінскай вобл.), бел. вучоны ў галіне ветэрынарнай мікрабіялогіі. Чл.-кар. Акадэміі агр. навук Беларусі (1992). Д-р вет. н. (1989). Скончыў Віцебскі вет. ін-т (1970). З 1972 у Бел. НДІ эксперым. ветэрынарыі імя С.Н.Вышалескага, з 1994 нач. Гал. ўпраўлення аграрнай адукацыі Мінсельгасхарча Беларусі. Навук. працы па дыягностыцы, спец. прафілактыцы і мерах барацьбы з інфекц. хваробамі жывёл.

*Тв.*: Профилактика пневмоний свиней. Мн., 1989; Справочник по болезням сельскохозяйственных животных. 2 изд. Мн., 1990 (у сааўт.); Справочник по болезням молодняка животных. Мн., 1995 (разам з М.В.Якубоўскім, Я.А.Панкаўцом).

**АНДРО́ЎСКАЯ** (сапр. Шульц) Вольга Мікалаеўна (21.7.1898, Масква — 31.3.1975), руская актрыса. Нар. арт. СССР (1948). З 1924 у трупе МХАТа. Выконвала пераважна камедыйныя ролі, вызначалася ўменнем ствараць складаныя характары. Сярод лепшых роляў: Сюзанна («Вар'яцкі дзень, або Жаніцьба Фігаро» П.Бамаршэ), лэдзі Тызл («Школа зласлоўя» Р.Шэрыдана), пані Конці («Сола для гадзінніка з боем» О.Заградніка). Здымалася на бел. кінастудыі ў фільмах «Мядзведзь» (1938) і «Чалавек у футарале» (1939). Дзярж. прэмія СССР 1952.

**АНДРУ́САЎ** Мікалай Іванавіч (19.12.1861, Адэса — 27.4.1924), рускі геолаг і палеантолаг, адзін з заснавальнікаў палеаэкалогіі. Акад. Пецярбургскай АН, чл.-кар. (1910). Праф. Юр'еўскага (1896) і Кіеўскага (1905) ун-таў, Вышэйшых жаночых курсаў у Пецярбургу (1912). Працаваў у Геал. к-це (Пецярбург). Навук. працы па стратыграфіі і палеанталогіі неагену Понтакаспійскага бас., тэктоніцы і палеагеаграфіі Альпійскай зоны Еўразіі, выкапнёвых рыфах, арганагенных вапняках. Даследаваў трацічныя адклады Паўн. Каўказа і Закаўказзя. Удзельнічаў у акіянаграфічных экспедыцыях на Чорным (1890) і Мармуровым (1894) морах, у заліве Кара-Багаз-Гол (1897).

Спаскі сабор Андронікава манастыра.

С.Андруховіч. Партрэт Я.Купалы. 1979.

**АНДРУХО́ВІЧ** Сцяпан Адамавіч (1.1.1909, в. Губіна Уздзенскага р-на Мінскай вобл. — 5.4.1989), бел. жывапісец. Скончыў Віцебскі маст. тэхнікум (1930). Працаваў у станковым жывапісе. Сярод твораў: «Веснавая сяўба» (1947), «Коні. На лузе» (1953), «Калгасны табун» (1958), лірычныя і індустр. пейзажы «Жыта» (1947), «Мінскае мора» (1954), «Новалукомль» (1966), «Пейзаж з лодкай» (1973), «Перад дажджом» (1975), партрэт Я.Купалы (1979) і інш.

**АНДРУШЭ́ВІЧ** Ян (пач. 16 ст. — 1567 ?), рэлігійны і дзярж. дзеяч ВКЛ, паэт-лацініст. Канонік у Вільні, біскуп у Кіеве і Луцку. Аўтар дыдактычна-рэліг. паэмы «Lens Lituana olim...» (каля 1543) пра легендарнае забойства ў Вільні 14 францысканскіх манахаў у перыяд княжання Альгерда (1345—77). Гал. змест і пафас паэмы ў апалагетычна-хрысц. тэндэнцыйнасці, дыдактызме, асуджэнні братазабойстваў.

*Літ.*: Дорошкевич В.И. Новолатинская поэзия Белоруссии и Литвы: Первая половина XVI в. Мн., 1979.

**АНДРЫЕ́ЎСКІ** Дзмітрый Мікалаевіч (4.10.1904, г. Пагара Бранскай вобл. — 18.12.1983), вучоны ў галіне арган. хіміі. Д-р хім. н., праф. (1965). Скончыў Ін-т тонкай хім. тэхналогіі ў Маскве (1930). З 1943 у авіяцыйным, з 1959 у індустрыяльным ін-тах г. Куйбышаў. У 1966—74 у БДУ. Даследаваў састаў сланцаў, вугалю, распрацоўваў тэхналогіі пірагенных працэсаў паліва, атрымання араматычных злучэнняў, вывучаў ізамерызацыю алканаў і цыклаалканаў.

*Тв.*: К вопросу термодинамики изомеризации метилалканов (разам з Г.Я. Кабо, Г.М.Роганавым) // Нефтехимия. 1975. № 1.

**АНДРЫЁЛІ** Міхал Эльвіра (26.11.1837, Вільня — 23.8.1893), жывапісец, рысавальшчык, ілюстратар. Бацька выхадзец з Італіі. Вучыўся ў Віленскай гімназіі, у Маскоўскім вучылішчы жывапісу і ваяння (1855—57), Пецярбургскай АМ (1857—59), у акадэміі Св. Лукі ў Рыме (1860). У 1861 на Рымскай выстаўцы адзначаны сярэбраным медалём. Працуючы ў Вільні, быў звязаны з рэв. коламі, прымыкаў да «*чырвоных*». У 1863 на Віленшчыне і ў Коўне ўдзельнічаў у

*паўстанні 1863—64.* У вер. 1863 арыштаваны, у студз. 1864 уцёк з ковенскай турмы за мяжу. Жыў у Лондане і Парыжы, стварыў шмат графічных работ пра падзеі 1863. Вярнуўся ў 1866 на радзіму, арыштаваны і сасланы ў Вятку, дзе стаў настаўнікам будучых рус. мастакоў В. і А.Васняцовых. З 1871 у Варшаве, прадаўжаў маст. адукацыю ў

І.Андрыч.

школе Герсана. У 1883—86 працаваў у Парыжы. У жывапісных і графічных работах адлюстроўваў жыццё і побыт бел. і літ. народаў, іх гіст. мінулае (графічныя творы «Смерць Кейстута», «Сутычка літвінаў з крыжаносцамі», «Хрышчэнне язычнікаў», «Смерць Людвіка Нарбута каля Дубічаў», «Залёты шаўца»). Напісаў партрэт Ф.Багушэвіча. Ілюстрацыі да кніг А.Міцкевіча, Ю.Славацкага, А.Мальчэўскага, Ю.Крашэўскага, У.Сыракомлі, Э.Ажэшкі, У.Шэкспіра, Дж.Ф.Купера, зробленыя пад уплывам рамантызму, вызначаюцца тэхн. лёгкасцю, багаццем фантазіі.

*Літ.:* История русского искусства. Т. 9, кн. 2. М., 1965; Andriolli — świadek swoich czasów: Listy i wspomnienia. Wrocław etc., 1976.

**АНДРЫЖЫЕЎСКІ** Анатоль Альгертавіч (н. 31.5.1944, г. Ульянаўск, Расія), бел. вучоны ў галіне энергетыкі. Д-р тэхн. н. (1994). Скончыў Маскоўскі ун-т (1969). З 1972 у Ін-це ядз. энергетыкі, з 1994 у Ін-це праблем энергетыкі АН Беларусі. Навук. працы па механіцы і цеплафізіцы дысперсных парагазавадкасных асяроддзяў, экалагічных аспектах узаемадзеяння энергет. і прыродных сістэм, міграцыі аэразольных выкідаў АЭС у аэра- і гідрасферах.

*Тв.:* Динамическая устойчивость работы системы неэквивалентных парогенерирующих каналов // Диссоциирующие газы как теплоносители и рабочие тела АЭС. Мн., 1981.

**А́НДРЫЧ** (Andrić) Іва (9.10.1892, в. Долак, каля г. Траўнік, Боснія — 13.3.1975), югаслаўскі пісьменнік і дыпламат. Д-р філасофіі (1924). Чл. Сербскай АН (з 1926), Югаслаўскай (з 1951) і Славенскай (з 1953) акадэмій навук і мастацтваў. У 1921—41 дыпламат у еўрап. краінах. Аўтар зб-каў лірычных вершаў у прозе «Ex ponto» (1918), «Неспакоі» (1920), апавяданняў і аповесцяў «Шлях Аліі Джэрджалеза» (1920), «Мост на Жэпе» (1947) і інш., кароткіх раманаў «Паненка» (1945), «Праклятыя двор» (1954). Сусв. вядомасць прынеслі гіст. раманы пра мінулае Босніі «Траўніцкая хроніка» і «Мост на Дрыне» (абодва 1945). Гал. рысы яго твораў — філас. напоўненасць і глыбокі псіхалагізм. Літ.-крыт. працы пра дзеячаў сербскай і сусветнай культуры. Нобелеўская прэмія 1961. На бел. мову творы А. перакладалі В.Рагойша, А.Разанаў, Л.Самасейка, Б.Сачанка, Г.Твараровіч, І.Чарота.

*Тв.:* Сабрана дела. Т. 1—17. Београд и др., 1981; Бел. пер. — Трывожны год. Мн., 1978; Мост на Дрыне; Праклятыя двор. Мн., 1993; Рус. пер. — Собр. соч. Т. 1—3. М., 1984—85.

*Літ.:* Иво Андрић: Биобиблиогр. указ. М., 1974; Поповић Р. Иво Андрић: Живот. Београд, 1988. *І.А.Чарота.*

**А́НДРЫЧ** (Andrycz) Ніна (н. 11.11.1915, Брэст), польская актрыса. Скончыла Ін-т тэатр. мастацтва ў Варшаве (1935). Працуе ў варшаўскім «Тэатры Польскім». Яркі тэмперамент актрысы найб. поўна раскрыўся ў ролях рамант. рэпертуару. Яе мастацтву ўласцівыя тонкасць псіхал. аналізу, трагічная глыбіня вобразаў: лэдзі Мільфард («Каварства і каханне» Ф.Шылера), Жанна («Святая Іаанна» Б.Шоу), Хімена і Ізабэла Лэнцкая («Лялька» паводле Б.Пруса).

М.Андрыёлі. Смерць Людвіка Нарбута каля Дубічаў.

**А́НДРЫЧЫК** (Andričik) Юрай (н. 22.4.1937, в. Бежаўцы Міхалаўскага р-на, Чэхія), славацкі паэт і перакладчык. Скончыў Ін-т рус. мовы і л-ры ў Празе (1960). Аўтар зб-каў паэзіі «Узыходжанне на зямлю» (1970), «Глухія зычныя» (1973), кн. апавяданняў для дзяцей «Павой» (1976). Асн. тэматыка творчасці — харство і багацце роднай зямлі, духоўнае жыццё сучасніка. Перакладае з рус., бел., укр., польск., чэшскай моў на славацкую. У яго перакладзе



**АНДРЫЯ́НАЎ** Кузьма Андрыянавіч (28.12.1904, в. Кандакова Цвярской вобл., Расія — 13.3.1978), савецкі хімік-арганік. Акад. АН СССР (1964; чл.-кар. 1953). Герой Сац. Працы (1969). Скончыў Маскоўскі ун-т (1930). З 1930 ва Усесаюзным электратэхн. ін-це, з 1954 у Ін-це элементаарган. злучэнняў АН СССР, адначасова з 1959 у Ін-це тонкай хім. тэхналогіі. Асн. навук. даследаванні па сінтэзе і распрацоўцы прамысл. тэхналогій новых высокамалекулярных злучэнняў, асабліва тэрмаўстойлівых крэмнійарган. палімераў, і матэрыялаў на іх аснове для электратэхн., лакафарбавай і буд. вытв-сці. Ленінская прэмія 1963. Дзярж. прэміі СССР 1943, 1946, 1950, 1953.

*Тв.:* Теплостойкие кремнийорганические диэлектрики. М.; Л., 1957; Методы элементоорганической химии: Кремний. М., 1968.

**АНДРЫЯ́НАЎ** Мікалай Яфімавіч (н. 14.11.1952, г. Уладзімір), расійскі спартсмен (гімнастыка). Абсалютны чэмпіён Алімпійскіх гульняў (1976, Манрэаль), алімпійскі чэмпіён у асобных відах многаборства (1972, Мюнхен, 1976). Абсалютны чэмпіён свету 1978, Еўропы 1975, СССР 1972—74. Чэмпіён свету 1974 і 1978, Еўропы і СССР у 1971—75 у асобных відах многаборства. Уладальнік Кубка свету 1975—77.

**АНДРЫЯ́ШАЎ** Аляксандр Міхайлавіч (1.9.1863, Чарнігаў — 1939), украінскі гісторык. Скончыў Кіеўскі ун-т (1886). Працаваў у архівах Львова, Кіева, Рэвеля, Рыгі, Пецярбурга, супрацоўнічаў з Кіеўскай археагр. камісіяй. Даследаваў гісторыю ўкр. зямель феад. перыяду («Нарыс гісторыі Валынскай зямлі да канца XIV ст.», 1887; «Нарыс гісторыі каланізацыі Пераяслаўскай зямлі да пачатку XVI стагоддзя», 1931).

**АНДРЭ́** (Andrè) Жак (25.2.1919, Парыж — 3.4.1988), французскі лётчык, удзельнік вызвалення Беларусі ў Вял. Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Засл. лётчык Францыі. Вучыўся ва ун-це, скончыў лётную школу. З 1943 у СССР у складзе знішчальнага авіяпалка «Нармандыя—Нёман» 1-й паветр. арміі. Удзельнік Віцебска-Аршанскай, Усх.-Прускай, Кёнігсбергскай аперацый. Зрабіў 113 баявых вылетаў, збіў 17 самалётаў праціўніка. Да 1969 у франц. арміі, палкоўнік.

**АНДРЭ́** (Andrée) Саламон Аўгуст (18.10.1854, Грэна — кастр. 1897), шведскі інжынер, даследчык Арктыкі. У 1882—83 прымаў удзел у навук. экспедыцыі на Шпіцберген. 11.7.1897 (з Н.Стрынбергам і К.Фрэнкелем) спрабаваў дасягнуць Паўн. полюса на паветр. шары «Арол» уласнай канструкцыі, аднак загінуў на в-ве Белы (на У ад Шпіцбергена). Рэшткі экспедыцыі знойдзены ў 1930. У гонар А. названа паўн. частка в-ва Зах. Шпіцберген (Зямля Андрэ).

**АНДРЭ́ЕВА** Ефрасіння Георгіеўна (н. 8.10.1931, в. Афонькіна Паўн.-Казахстанскай вобл.), бел. вучоны ў галіне педагогікі. Д-р пед. н. (1988), праф. (1991). Скончыла Башкірскі пед. ін-т (1955). З 1958 у Мінску. Працавала ў Мін-ве адукацыі Беларусі і НДІ педагогікі, з 1974 у Бел. пед. ун-це. Даследуе гісторыю нар. асветы і пед. думкі Беларусі. Аўтар дапаможнікаў для студэнтаў ВНУ.

*Тв.*: Гісторыя педагогікі. Ч. 1. Гісторыя замежнай педагогікі са старажытных часоў да 1992 г. Мн., 1992; Гісторыя педагогікі. Ч. 2. Гісторыя педагогікі Беларусі са старажытных часоў да 1917 г. Мн., 1993.

**АНДРЭ́ЕВА** (сапр. Юркоўская) Марыя Фёдараўна (1868, С.-Пецярбург — 8.12.1953), руская актрыса. З 1894 артыстка Т-ва мастацтва і л-ры, у 1898—1905 у МХТ. З тонкім лірызмам выконвала ролі ў п'есах Г.Гаўптмана (Раўтэндэляйн — «Патанулы звон», Кетэ — «Адзінокія»), А.Чэхава (Ірына — «Тры сястры», Аня — «Вішнёвы сад»), М.Горкага (Наташа — «На дне», Ліза — «Дзеці сонца», Мар'я Львоўна — «Дачнікі»). Адна са стваральнікаў і артыстка (1919—26) Вял. драм. т-ра ў Петраградзе. У 1931—48 дырэктар Маскоўскага Дома вучоных.

**АНДРЭ́ЕВЫЯ ІМХІ́**, андрэіды (Andreaeidae), падклас лістасцябловых імхоў. Уключае 2 сям.: андрэевыя (120 відаў) і андрэебрыевыя (1 від). На Беларусі адзін род — *андрэя* з сям. андрэевых.

Старажытная група імхоў, якія, магчыма, існуюць з верхняга дэвону-карбону. Шэрагам прыкмет нагадваюць *брыевыя імхі*, адрозніваюцца тым, што каробачка раскрываецца прадаўгаватымі шчылінамі, як у пячоначнікаў. Прыстасаваны да скальна-камяністых субстратаў, вытрымліваюць нізкія т-ры і працяглае высыханне. *Г.Ф.Рыкоўскі.*

**АНДРЭЕ́СКУ** (Andreescu) Іон (15.11.1850, Бухарэст — 22.10.1882), румынскі жывапісец. Вучыўся ў Школе прыгожых мастацтваў у Бухарэсце (1869—72), у акадэміі Жуліяна ў Парыжы (1879—81). У канцы 1870-х г. працаваў у Францыі разам з жывапісцамі *барбізонскай школы жывапісу*. Пейзажы і партрэты адметныя лірызмам, тонкасцю каларыту: «Чабан з авечкамі» (1873), «У лесе Бузэу» (1874), «Дарога па ўзгорках», «Сялянка ў зялёнай хустцы», аўтапартрэт, «Зіма ў Барбізоне» (усе 1881) і інш.

І.Андрэеску. Аўтапартрэт.

**АНДРЭ́ЕЎ** (сапр. Пракоф'еў) Аляксандр Аляксандравіч (13.4.1923, С.-Пецярбург — 10.1.1960), рускі паэт, перакладчык. Скончыў Ленінградскі ун-т (1948). Аўтар зб-каў вершаў «Зорка пакаленняў» (1959) і «Сонца Ленінграда» (1961). Перакладаў на рус. мову творы ўкр., эст., чэшскіх і інш. паэтаў. Першыя пераклады з бел. паэзіі змешчаны ў «Анталогіі беларускай паэзіі» (Л., 1948). Пераклаў паэму «Безназоўнае» і шмат вершаў Я.Купалы, асобныя творы П.Броўкі, А.Куляшова, М.Танка, М.Лужаніна, В.Віткі і інш.

**АНДРЭ́ЕЎ** Аляксей Леанідавіч (н. 24.2.1920, С.-Пецярбург), рускі і бел. артыст балета і балетмайстар. Засл. арт. Расіі (1957), засл. дз. маст. Беларусі (1963). Скончыў Ленінградскае харэагр. вучылішча (1939). Да 1959 саліст і балетмайстар Ленінградскага т-ра оперы і балета імя Кірава. У 1960—64 і 1971—73 гал. балетмайстар Дзярж. т-ра оперы і балета БССР. Паставіў (разам з Н.Стукалкінай) першыя нац. балеты на сучасную тэму «Мара» Я.Глебава (1961)

Б.Ф.Андрэеў.

і «Святло і цені» Г.Вагнера (1963). З інш. пастановак на бел. сцэне: «Казка пра мёртвую царэўну і сем асілкаў» У.Дзешавова на тэмы А.Лядава (1961), «Дон Кіхот» Л.Мінкуса (1962), «Трыстан і Ізольда» на муз. Р.Вагнера і «Балеро» на муз. М.Равеля (1963), «Гарэзлівыя частушкі» на муз. Р.Шчадрына (1971; усе са Стукалкінай).

*Літ.*: Грищенко М.М. Белорусский балет и современная тема. Мн., 1989.

**АНДРЭ́ЕЎ** Анатоль Яўгенавіч (н. 14.9.1916, г. Рагачоў Гомельскай вобл.), адзін з кіраўнікоў партыз. руху на тэр. Віцебскай і Беластоцкай абл. у Вял. Айч. вайну, дзярж. дзеяч БССР. Герой Сац. Працы (1976). Скончыў Рэсп. партшколу пры ЦК КП(б)Б (1950), ВПШ пры ЦК КПСС (1959). З ліст. 1941 кіраваў падп. групай на чыг. ст. Орша. У 1942—44 камісар, камандзір партыз. атрадаў. З 1961 нач. Гал. ўпраўлення, у 1963—64 міністр аўтатранспарту БССР. Старшыня Бел. рэсп. савета ветэранаў вайны, працы і ўзбр. сіл (1987—94), Камісіі па справах б. партызан і падпольшчыкаў пры Прэзідыуме ВС БССР (1987—92). Чл. ЦК КПБ (1966—86). З 1986 чл., у 1990—91 нам. старшыні Рэвіз. камісіі КПБ. Дэп. ВС БССР у 1963—85, нар. дэп. СССР у 1989—91.

**АНДРЭ́ЕЎ** Андрэй, майстар разьбярскай і сталярнай справы 17 ст. Родам з Беларусі. У 2-й пал. 17 ст. працаваў у Аружэйнай палаце Маскоўскага Крамля. У 1684 «са таварышчы рабілі крэслы вялікай гасударыні, ларцы і паднасныя сталы».

**АНДРЭ́ЕЎ** Барыс Фёдаравіч (9.2.1915, Саратаў — 25.4.1982), рускі кінаакцёр. Нар. арт. СССР (1962). Скончыў Саратаўскі тэатр. тэхнікум (1937). Стварыў вобразы простых, знешне грубаватых хлопцаў, у якіх раскрываў душэўную

шчодрасць, шырыню рус. нар. характару (Назар Дума ў «Трактарыстах», 1939; Бурмак у «Паданні аб зямлі Сібірскай», 1948); Саша Свінцоў у фільме «Два байцы», 1943). З 1950 выконваў пераважна псіхалагічна глыбокія драм. ролі: Сава Зарудны («Паэма пра мора», 1958), Глазуноў («Аповесць палымяных гадоў», 1961), Расамаха

Л.М.Андрэеў.

(«Шлях да прычала», 1962), Важак («Аптымістычная трагедыя», 1963) і інш. Дзярж. прэміі СССР 1948, 1950.

**АНДРЭ́ЕЎ** Васіль Васілевіч (3.1.1861, г. Бежацк Цвярской вобл. — 26.12.1918), рускі музыкант, балалаечнік-віртуоз. У 1838 заснаваў у Пецярбургу першы аркестр рус. нар. інструментаў (з 1923 імя А.), канцэртаваў з ім па Расіі, краінах Зах. Еўропы, ЗША. Пры яго ўдзеле ўдасканалена нар. балалайка, створаны яе аркестравыя разнавіднасці; арганізаваны многія аркестры рус. нар. інструментаў. Зацвердзіў балалайку як канцэртны інструмент. Аўтар каля 40 п'ес для балалайкі і аркестра, школы ігры на балалайцы (1894).

*Літ.*: В.В.Андреев: Материалы и документы. М., 1986.

**АНДРЭ́ЕЎ** Восіп, разьбяр па дрэве 17 ст. Выхадзец з Оршы. Працаваў у Аружэйнай палаце Маскоўскага Крамля. У 1685 разам з інш. бел. разьбярамі рабіў іканастас «з флемаванымі дарожнікамі» і калонкамі для Новадзявочага манастыра ў Маскве.

**АНДРЭ́ЕЎ** Іван (?, Полацк — 1679), майстар-чаканшчык па серабры. Са студз. 1660 майстар чаканнай справы Сярэбранай палаты Маскоўскага Крамля. Працаваў пераважна над рэльефнымі ўпрыгожаннямі. Сярод работ срэбраныя пазалочаныя рукамыйнікі царэвічаў Івана і Пятра (1676, зробленыя з Іванам Пракоф'евым, Васілём Іванавым і Ларыёнам Афанасьевым).

**АНДРЭ́ЕЎ** Леанід Мікалаевіч (21.8.1871, г. Арол — 12.9.1919), рускі пісьменнік. Скончыў Маскоўскі ун-т (1897). Друкаваўся з 1892. Раннія творы вытрыманы ў традыцыях крытычнага рэалізму («Вялікі шлем», «Пецька на дачы», «Анёлачак», «Жылі-былі»). Спачуваў рэвалюцыянерам, пратэставаў супраць вайны («Іншаземец», «Марсельеза», «Чырвоны смех»). У больш позніх творах («Сцяна», «Думка», «Бездань», «Жыццё Васіля Фівейскага») адчуваецца песімізм, падкрэсліваецца бяссілле чалавечага розуму. Рэвалюцыя 1905—07 абвастрыла цікавасць да сац. праблем (драмы «Да зор», 1905, выд. 1906; «Губернатар», 1906; «Апавяданне пра сем павешаных», 1908), а яе паражэнне выклікала расчараванне; матывы адчаю, вобразы смерці ідуць побач з паэтызацыяй анархічнага бунту: п'есы «Сава» (1906), «Жыццё чалавека» (1907), «Чорныя маскі», «Цар Голад» і «Анатэма» (усе 1908); апавяд. «Цемра», «Праклятае звера» (абодва 1907); раман «Сашка Жыгулёў» (1911). Пасля Кастр. рэвалюцыі жыў у Фінляндыі.

*Тв.*: Собр. соч. Т. 1—17. Спб., 1911—17; Красный смех. Мн., 1981.

**АНДРЭ́ЕЎ** Мікалай Андрэевіч (26.10.1873, Масква — 24.12.1932), рускі скульптар і графік. Засл. дз. маст.

І.Андрэеў. Рукамыйнік. 1676.

РСФСР (1931). Вучыўся ў Строганаўскім вучылішчы (1885—91) і Маскоўскім вучылішчы жывапісу, скульптуры і дойлідства (1892—1901). Аўтар помнікаў М.В.Гогалю (1909), А.І.Герцэну і М.П.Агарову (1922), А.М.Астроўскаму (1929; усе ў Маскве); серыі скульптурных і графічных партрэтаў У.І.Леніна (1919—32), графічных партрэтаў М.Горкага, К.Станіслаўскага, В.Качалава і інш.

**АНДРЭ́ЕЎ** Мікалай Мікалаевіч (28.7.1880, с. Курмане Палтаўскай губ. — 31.12.1970), рускі фізік; стваральнік сав. навук. школы акустыкі і гідраакустыкі. Акад. АН СССР (1953, чл.-кар. 1933). Герой Сац. Працы (1970). Скончыў Базельскі ун-т (1909). З 1912 працаваў у ВНУ і НДІ Масквы і Ленінграда, з 1940 у Фіз., з 1954 у Акустычным ін-тах АН СССР. Навук. працы па фіз. і тэхн. акустыцы і тэорыі ваганняў. Аўтар першай тэорыі распаўсюджвання гуку ў рухомых асяроддзях.

*Літ.*: Глекин Г.В. Н.Н.Андреев, 1880—1970. М., 1980.

**АНДРЭ́ЕЎ** Мікалай Пятровіч (23.11.1892 — 15.1.1942), рускі літаратуразнавец і фальклярыст. Даследаваў рус. і ўкр. казкі. У аснову «Паказальніка казачных сюжэтаў» (1929) паклаў паказальнік казачных тыпаў фін. вучонага А.*Аарнэ*. Пазней адмовіўся ад фармаліст. метадаў даследавання фальклору і выступіў з крытыкай канцэпцыі фін. школы. У працах «Фальклор і літаратура» (1936), «Фальклор у паэзіі Някрасава» (1936), «Творы Пушкіна ў фальклоры» (1937) і інш. разглядаў узаемадзеянне л-ры і фальклору. Яго паказальнік казачных сюжэтаў выкарыстаў Л.Бараг у паказальніку «Сюжэты і матывы беларускіх народных казак» (1978).

*Літ.*: Астахова А.М. Н.П.Андреев в истории советской фольклористики 20—30-х годов // Очерки истории русской этнографии, фольклористики и антропологии. М., 1971. Вып. 5. *І.У.Саламевіч.*

**АНДРЭ́ЕЎ** Павел Захаравіч (9.3.1874, с. Осьміна, Лужскі р-н Ленінградскай вобл. — 14.9.1950), рускі спявак (бас-барытон). Нар. арт. СССР (1939). Скончыў Пецярбургскую кансерваторыю (1903, з 1919 выкладаў у ёй, праф. з 1926). Удзельнічаў у «Рускіх сезонах» С.П.Дзягілева (у 1913—14). Сярод лепшых партый: Руслан («Руслан і Людміла» М.Глінкі), Князь Ігар і Барыс Гадуноў у аднайм. операх А.Барадзіна і М.Мусаргскага.

*Літ.*: Лебедев Д. П.З.Андреев: Очерк жизни и творческой деятельности. Л., 1971.

**АНДРЭ́ЕЎ** Уладзімір Аляксеевіч (н. 27.8.1930, Масква), рускі акцёр і рэжысёр. Нар. арт. СССР (1985). Скончыў Ін-т тэатр. мастацтва імя А.Луначарскага (1952). Акцёр, з 1970 гал. рэжысёр Маскоўскага т-ра імя М.Ярмолавай. З 1985 гал. рэжысёр Малога т-ра Расіі. Выкладае ў Рас. акадэміі тэатр. мастацтва, праф. з 1978. Сярод роляў: Аляксей («У добры час» В.Розава), Васількоў («Шалёныя грошы» А.Астроўскага), Галубкоў («Бег» М.Булгакава) і інш. Паставіў спектаклі: «Мінулым летам у Чулімску» і «Паляванне на качак» А.Вампілава, «Грошы для Марыі» паводле В.Распуціна, «Бераг» паводле Ю.Бондарава і інш. Дзярж. прэмія Расіі імя К.Станіслаўскага 1980.

**АНДРЭ́ЕЎ** Фёдар Андрэевіч (1879, Вільня — 9.12.1952), патафізіёлаг і клініцыст. Засл. дз. нав. РСФСР. Скончыў Маскоўскі ун-т (1906). Вучань рус. патолага А.Б.*Фохта*. Працаваў у мед. ін-тах Масквы, Свярдлоўска. У 1934—38 заг. кафедры ў Мінскім мед. ін-це. У 1913 распрацаваў новы метад ажыўлення арганізма артэрыяльным нагнятаннем крыві. Навук. працы па вывучэнні ролі ЦНС у патагенезе захворванняў унутр. органаў, патафізіялогіі і фізіялогіі

сэрца, лёгкіх, аліментарнай дыстрафіі, пра ролю канстытуцыі чалавека ў развіцці паталаг. працэсу.

**АНДРЭ́ЕЎ-БУРЛА́К** (сапр. Андрэеў) Васіль Мікалаевіч (1.1.1843, г. Ульянаўск — 10.5.1888), рускі акцёр. Вучыўся ў Казанскім ун-це. У т-ры з 1868. Ад камедыйнага акцёра, схільнага да імправізацыі і фарсавых прыёмаў ігры, эвалюцыяніраваў да рэалізму. У распрацоўцы тэмы «маленькага чалавека» спалучаў характарнасць з глыбокім псіхалагізмам. Сярод роляў: Шчасліўцаў («Лес» А.Астроўскага), Расплюеў («Вяселле Крачынскага» А.Сухаво-Кабыліна) і інш. Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў першага прыватнага т-ра ў Маскве (т.зв. Пушкінскі т-р, 1880). Стварыў (разам з М.Пісаравым) «Першае таварыства рускіх акцёраў» (1883). Майстар маст. чытання.

**АНДРЭ́ЕЎСКІ СЦЯГ**, сцяг на карме судна ў расійскім ВМФ. Уведзены ў 1699 Пятром I. Палотнішча з блакітным крыжам па дыяганалі (крыж Андрэя Першазванага) спачатку было трохпалоснае — бела-сіне-чырвонае, потым (з 1709) аднаго з гэтых колераў, з 1865 — белае.

**АНДРЭ́ЕЎШЧЫНА**, вёска ў Беларусі, у Аршанскім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 4 км на Пн ад г. Орша, 84 км ад Віцебска, 10 км ад чыг. ст. Орша, на шашы Орша—Віцебск. 3182 ж., 943 двары (1994). Камбінат буд. матэрыялаў, з-д жалезабетонных вырабаў, райсельгасэнерга, аграрна-прамысл. аб'яднанне «Белая Русь». Сярэдняя школа, базавая спец. школа-інтэрнат, клуб, 3 б-кі, амбулаторыя, аддз. сувязі, камбінат быт. абслугоўвання.

**АНДРЭ́Й** (Васіла, Вісіла, Андрэй Паляк; ? — 1398), рэлігійны дзеяч, першы віленскі біскуп у ВКЛ (1388—98). Вучыўся ў Гнезне, служыў у Кракаве. З 1374 сакратар і казначэй пры двары польскага караля. Садзейнічаў шлюбу каралевы Ядвігі з вял. кн. ВКЛ Ягайлам, пасля заключэння яго (1386) апошні даў згоду на ўтварэнне Віленскага біскупства і прызначэнне А. біскупам. У 1392 А. каранаваў Вітаўта на ВКЛ, заручыўшыся яго падтрымкай у правядзенні палітыкі пашырэння каталіцызму на тэр. ВКЛ. Быў вымушаны прызнаваць праваслаўе, бел. мову, паліт. незалежнасць ВКЛ ад Польшчы.

**АНДРЭ́Й** (свецкае Крыт Аляксандр; ? — 21.5.1983), бел. рэлігійны дзеяч. Да 2-й сусв. вайны жыў у Зах. Беларусі. Пасля вайны ў Германіі, Англіі: святар у прыходах, адміністратар Вікарыяльнай управы Беларускай аўтакефальнай правасл. царквы ў замежжы (БАПЦ). З 1961 у ЗША: настаяцель прыхода св. Жыровіцкай Маці Божай у Кліўлендзе (ініцыятар рэліг. навучання дзяцей-беларусаў, у т.л. па гісторыі царквы на Беларусі). У 1969 епіскап, з 1970 архіепіскап епархіі БАПЦ у Паўн. Амерыцы. З 1972 мітрапаліт БАПЦ.

*Л.У.Языковіч.*

**АНДРЭ́Й АЛЬГЕ́РДАВІЧ**, Андрэй Полацкі (1325—99), князь полацкі, пскоўскі і трубчэўскі. Сын *Альгерда* і віцебскай князёўны Марыі Яраслаўны. У 1342 жыхарамі Пскова абраны князем, за захаванне княжацкай пасады ў Пскове змагаўся і тады, калі стаў полацкім князем. Удзельнічаў у паходзе цвярскога кн. Міхаіла на Маскву (1372). Вёў актыўную барацьбу з крыжакамі, у 1373 і 1375 правёў паспяховыя паходы на Дынабург. Пасля 1377 распачаў барацьбу за велікакняжацкі пасад у ВКЛ. Пацярпеўшы паражэнне, вярнуўся княжыць у Пскоў. Уступіўшы ў саюз з вял. кн. маскоўскім Дзмітрыем Данскім, удзельнічаў у разгроме татараў на р. Вожа (1378), адваяваў у ВКЛ для Масквы северскія гарады Трубчэўск і Старадуб, удзельнічаў у *Кулікоўскай бітве 1380*. Пазней вярнуўся ў Полацк, выступіў супраць *Ягайлы* (1386), але трапіў у палон. Вызвалены ў 1390, стаў на бок *Вітаўта* ў яго барацьбе супраць *Скіргайлы*. Зноў княжыў у Пскове. Загінуў у *бітве на Ворскле 1399*.

М.Андрэеў. Помнік М.В.Гогалю ў Маскве. 1909.

*М.І.Ермаловіч.*

**АНДРЭ́Й БАБО́ЛЯ** (1591—16.5.1657), бел. святы, езуіцкі манах, прапаведнік. Прапагандаваў ідэі *Брэсцкай уніі 1596* у Вільні, Бабруйску, Полацку, Ломжы і Пінску, за што прызваны пінскім апосталам. У час вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67 захоплены ў 1657 казакамі і пасля катаванняў забіты. Пахаваны ў Пінску. У 1827 яго мошчы перанесены ў Полацк. Кананізаваны ў 1938 папам Піем IX.

**АНДРЭ́Й БАГАЛЮ́БСКІ** (каля 1112 — 29.6.1174), князь уладзіміра-суздальскі (1157—74). Сын Юрыя Далгарукага. Каля 1150—51 яму належалі Тураў і Пінск. У 1169 захапіў Кіеў; пад яго ўплыў трапілі Смаленскія і Дзвінскія землі. Змагаўся супраць феад. знаці, спрыяў развіццю гандлю і рамяства, перанёс сталіцу княства ва Уладзімір. У час яго праўлення *Уладзіміра-Суздальскае княства* стала найб. моцным на Русі. Забіты ў сваім замку ў Багалюбаве.

**АНДРЭ́Й ПО́ЛАЦКІ**, гл. *Андрэй Альгердавіч*.

**АНДРЭ́Й УЛАДЗІ́МІРАВІЧ** (каля 1390—1457?), князь, адзін з найбуйнейшых праваслаўных магнатаў ВКЛ. Сын кіеўскага кн. Уладзіміра з роду Альгердавічаў, брат Алелькі (Аляксандра, гл. ў арт. *Алелькавічы*) і Івана Бельскага (гл. ў арт. *Бельскія*). У адрозненне ад братоў удзельнага княства не атрымаў, але займаў высокае становішча ў ВКЛ, уваходзіў у велікакняжацкую раду. Уладальнік маёнткаў Лагойск, Гайна і Камянец (Менскі пав.), Славенск (Ашмянскі пав.), Палонна і Лемніца (Віцебская зямля) і інш.


Андрэеўскі сцяг.

*В.Л.Насевіч.*

**АНДРЭ́ЙКА** (Andreiko) Андрыс Георгіевіч (17.10.1942, Рыга — 10.3.1976), латвійскі спартсмен (міжнар. шашкі). Міжнар. гросмайстар. Чэмпіён свету (1968—72), уладальнік Кубка свету (1966). Чэмпіён Еўропы (1974), чэмпіён СССР (1961, 1965—66, 1968, 1970—72, 1975). Пераможца міжнар. турніраў (1962—67, 1969, 1973).

**АНДРЭ́ЙЧЫКІ**, вёска ў Беларусі, у Раснянскім с/с Сенненскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса. За 15 км на ПдУ ад Сянна, 80 км ад Віцебска, 2,5 км ад чыг. раз'езда. 295 ж., 135 двароў (1995). Базавая школа, б-ка, клуб, аддз. сувязі.

**АНДРЭО́ЦІ** (Andreotti) Джуліо (н. 14.1.1919, Рым), італьянскі дзярж., паліт. і грамадскі дзеяч, пісьменнік і публіцыст. Доктар права. Уключыўся ў паліт. дзейнасць з 1942. У 1943—44 у антыфаш. апазіцыі. Адзін з заснавальнікаў і рэдактар цэнтр. органа хрысц.-дэмакр. партыі (ХДП) газ. «Il Popolo» («Народ»). З 1944 чл. Нац. савета ХДП, адзін з яе кіраўнікоў. З 1948 дэпутат парламента, кіраўнік парламенцкай фракцыі ХДП (1968—72), займаў міністэрскія пасады. У 1972—73, 1976—79, 1989—92 старшыня Савета Міністраў. Абвінавачаны ў карупцыі ў 1993, адышоў ад паліт. дзей-

насці. Аўтар паліт. памфлетаў, прац па навейшай гісторыі Італіі і інш.

**АНДРЭ́Я** (Andreaea), род лістасцябловых імхоў сям. андрэевых. Каля 120 відаў. Растуць у высокіх шыротах і высакагор'ях па ўсім зямным шары. На Беларусі ў зах. раёнах трапляецца А. скальная (A. rupestris).

Утварае невял. цвёрдыя дзернавінкі ад бура-зялёнага да чырвона-бурага колеру. Сцяблы 1—2 см выш., прамыя або прыўзнятыя, густа ўкрытыя лісцем. Лісце прадаўгавата-яйцападобнае або яйцападобна-ланцэтнае, тупое, без жылак, вельмі гіраскапічнае. Каробачка на псеўданожцы, прадаўгаватаавальная, раскрываецца 4 прадаўгаватымі шчылінамі. *Г.Ф.Рыкоўскі.*

**А́НДХРА-ПРА́ДЭШ**, штат на ПдУ Індыі. Пл. 276,8 тыс. км², нас. 66,5 млн. чал. (1991), пераважна андхра (тэлугу); гарадскога 20%. Адм. цэнтр — Хайдарабад, буйныя гарады: Вішакхапатнам, Віджаявада. Займае прыбярэжную нізіну ўздоўж Бенгальскага заліва, частку пласкагор'я Дэкан і гор Усх. Гаты (выш. да 1680 м). Клімат вільготны, трапічны, мусонны на ўзбярэжжы (1500 мм ападкаў за год), ва ўнутр. раёнах з засушлівай зімой (ападкаў 500—850 мм за год). Адзін з асн. с.-г. штатаў Індыі. Гал. с.-г. культуры: рыс, тытунь, клешчавіна, кенаф, цукр. трыснёг, таксама вырошчваюць проса, арахіс, бавоўнік і інш. У жывёлагадоўлі пераважае авечкагадоўля. Традыцыйныя галіны прам-сці — тытунёвая, цукровая. Развіты горназдабыўная (каменны вугаль, слюды, хрызалітавы азбест, барыты, вапнякі, буд. матэрыялы, жал. і марганцавая руды, храміты, свінец), металург., хім., маш.-буд. прам-сць. Транспарт чыг., марскі (гал. порт Вішакхапатнам), аўтамабільны. *З.М.Шуканава.*

Андрэя скальная.

**А́НДЫ**, Андыйскія Кардыльеры (Andes, Cordillera de los Andes), горная сістэма на Пн і З Паўн. Амерыкі, выцягнутая ў мерыдыянальным напрамку ўздоўж берагоў Ціхага ак. на тэр. Венесуэлы, Калумбіі, Эквадора, Перу, Балівіі, Чылі і Аргенціны. Самая доўгая (9000 км) і адна з самых высокіх (6980 м,г. Аканкагуа) горных сістэм зямнога шара. З'яўляецца кліматападзелам паміж паветранымі масамі Атлантычнага і Ціхага акіянаў, важны гідраграфічны вузел мацерыка. Складаюцца пераважна з субмерыдыянальных паралельных хрыбтоў — *Усходнія Кардыльеры Андаў, Цэнтральныя Кардыльеры Андаў, Заходняя Кардыльера Андаў, Берагавыя Кардыльеры Андаў*, паміж якімі ўнутр. пласкагор'і і плато (Пуна, Альтыплана) ці ўпадзіны. Па сукупнасці прыродных асаблівасцяў і арографіі вылучаюць А. Паўн., Цэнтр. і Паўднёвыя. Паўночныя А. падзяляюцца на *Карыбскія Анды*, Паўн.-Зах. А., якія прадстаўлены 3 асн. Кардыльерамі (Усходняя, Заходняя і Цэнтральная), і Экватарыяльныя А. (складаюцца з 2 Кардыльераў — Заходняй і Усходняй). Цэнтральныя А. (да 28° паўд. ш.) уключаюць Перуанскія А. і ўласна Цэнтр. А., ці *Цэнтральнаандыйскае нагор'е*. У Паўднёвых А. вылучаюць Чылійска-Аргенцінскія (Субтрапічныя А.) і *Патагонскія Анды*. Паводле будовы А. — адроджаныя герцынскія структуры, узнесеныя навейшымі падняццямі альпійскай складкавасці на месцы Андыйскага (Кардыльерскага) геасінклінальнага складкавага пояса; зона землетрасенняў і актыўнага сучаснага вулканізму: 70 вулканаў, у т.л. 30 дзеючых (Катапахі, Льюльяйльяка, Сангай, Сан-Педра і інш.). Карысныя выкапні: руды волава («алавяны пояс» Балівіі), медзі («медны пояс» Чылі і Перу), вальфраму, сурмы, вісмуту, селену, серабра, свінцу, цынку, жалеза, золата, плаціны; у перадгор'ях, міжгорных прагінах і ўпадзінах (Маракайба, Магдалены) радовішчы нафты. У А. пачынаюцца вытокі і прытокі Амазонкі, Арынока, Парагвая, Параны і рэкі Патагоніі, знаходзяцца вял. азёры: Маракайба, Тытыкака, Паапо і інш. Значныя вышыня і працягласць А. з Пн на Пд, кантрасты ва ўвільгатненні (на зах., наветраных, схілах да 5000—8000 мм ападкаў за год — на З Калумбіі і Пд Чылі, на ўсх., падветраных, каля 3000 мм — экватарыяльная паласа, вельмі сухія ўзбярэжжы — да 100 мм за год у Перу і Чылі), наяўнасць зледзянення (найб. значнае ў Патагонскіх А., больш за 20 тыс. км²), узровень снегавой лініі ад 4200—4900 м каля экватара да 6300 м у Перу абумовілі рэзка выяўленую пояснасць і вял. разнастайнасць ландшафтаў. Наветраныя вільготныя схілы ад Паўн.-Зах. А. да Пд Цэнтр. А. укрыты горнымі вільготнымі экватарыяльнымі і трапічнымі лясамі (горныя гілеі), у якіх вылучаюць 3 вышынныя паясы: *т'ера-кальентэ* (гарачая зямля), *т'ера-тэмплада* (умераная зямля) і *т'ера-фрыз* (халодная зямля). У Субтрапічных А. вечназялёныя сухія лясы і хмызнякі, на Пд ад 38° паўд. ш. вільготныя вечназялёныя і мяшаныя лясы. Расліннасць высакагорных плато мае шэраг асаблівасцяў: на Пн горныя экватарыяльныя лугі парамас, у Перуанскіх А. і на ПнУ Пуны сухі высакагорны стэп халка, на ПдЗ Пуны і ўсім Ціхаакіянскім узбярэжжы паміж 5—28° паўд. ш. пустынныя тыпы расліннасці. Жывёльны свет: шыраканосыя малпы, непаўназубыя (мурашкаед, браняносец, лянівец), ягуар, пума, лама, гуанака, алені уэмул і пуду, грызуны тука-тука і шыншыла; з птушак — кондар, тукан, калібры і інш. А. — радзіма хіннага дрэва, кокі, батату, лімскай фасолі і інш. каштоўных раслін. Даследаваў А. бел. геолаг І.І.Дамейка, у гонар якога названы хрыбет. *М.В.Лаўрыновіч.*

**АНДЫЖА́Н**, горад ва Узбекістане, цэнтр Андыжанскай вобл. Размешчаны ў паўд.-ўсх. ч. Ферганскай даліны на р. Андыжансай. Вядомы з 9 ст. 297 тыс. ж. (1990). Чыг. вузел. Машынабудаванне і металаапрацоўка (абсталяванне для ірыгацыйных збудаванняў і бавоўнаачышчальных прадпрыемстваў; эл.-тэхн. вырабы і інш.), хім., лёгкая (баваўняная, абутковая, трыкатажная і інш.), харчасмакавая (масларобная, кансервавая, гідролізная, мясная і інш.) прам-сць; вытв-сць буд. матэрыялаў. У раёне А. — здабыча нафты і газу. 4 ВНУ. Музей.

**«АНДЫ́НА»**, («Ondyna druskienickich źródeł», «Ундзіна друскеніцкіх крыніц»), літаратурна-гістарычны і медыцынскі часопіс. Выходзіў у 1844—46 на польск. мове раз на месяц у час курортнага сезона (крас. — снеж.) у Друскеніках (цяпер Друскінінкай, Літва). У літ. аддзеле пераважала белетрызаваная проза. Лейтматывам паэт. твораў («Сеймікі павятовыя» К.Буйніцкага) была ідэалізацыя мінулага, крытыка арыстакратыі. У гіст. аддзеле былі змешчаны артыкулы Т.Нарбута («Аб імёнах жонак вял. князя літоўскага Альгерда», «Заўвагі наконт аўтэнтычнасці падаравання Вітаўта троскаму манастыру»), В.Мацэёўскага («Бібліятэка шляхецкая і валасная польскага грамадзяніна 16 ст.») і інш.

*Я.С.Умецкая.*

**АНДЭЗІ́Т**, кайнатыпная горная парода, эфузіўны аналаг *дыярыту*. Складаецца пераважна з мікракрышталёў плагіяклазу, аўгіту і інш. мінералаў, апушчаных у вулканічнае шкло. Ва ўкраплennях тыя ж мінералы, рагавая падманка, біятыт. Структура парфіравая. Уласцівы слупковыя паасобнасці. Колер ад шэрага да чорнага, іншы раз з зялёным адценнем. Шчыльн. 2280—2680 кг/м$^3$. Разам з базальтамі ўтварае гал. масу вылітых парод у абласцях стараж. і сучаснага вулканізму. На Беларусі трапляецца ў адкладах валынскай серыі верхняга пратэразою.

**А́НДЭРС** (Anders) Уільям Алісан (н. 17.10.1938, Ганконг), касманаўт ЗША. Скончыў Ваенна-марскую акадэмію ЗША (1955). З 1963 у групе касманаўтаў НАСА. 21—26.12.1968 разам з Ф.Борманам і Дж.Ловелам здзейсніў першы палёт да Месяца з выхадам на селенацэнтрычную арбіту на касм. караблі «Апалон-8» як пілот месяцавай кабіны. Карабель зрабіў 10 абаротаў вакол Месяца, вярнуўся на Зямлю. Палёт працягваўся 6,125 сут.

**А́НДЭРС** (Anders) Уладзіслаў (11.8.1892, г. Блоне каля Варшавы — 12.5.1970), польскі ваенны і паліт. дзеяч. Генерал дывізіі (1941). Вучыўся ў Вышэйшым тэхн. вучылішчы ў Рызе (1911—14), скончыў Вышэйшае ваен. вучылішча ў Парыжы (1923). У 1-ю сусв. вайну ў рас. арміі. З 1918 у Войску Польскім. Удзельнік польска-сав. вайны 1920. У час дзярж. пераваротy Ю.*Пілсудскага* (май 1926) нач. штаба ўрадавых войскаў. Камандаваў Валынскай (1928—37) і Навагрудскай (1934—39) брыгадамі кавалерыі, на пач. 2-й сусв. вайны — аператыўнай групай. Інтэрніраваны 29.9.1939 сав. войскамі ў час паходу ў Зах. Беларусь. У жн. 1941 вызвалены з палону і прызначаны У.*Сікорскім* камандуючым польскай арміяй у СССР, якую ў 1942 вывеў на Б. Усход (гл. *Андэрса армія*). На чале 2-га Польскага корпуса ўдзельнічаў у *Італьянскай кампаніі 1943—45*. У 1946—54 Вярх. галоўнакамандуючы і Ген. інспектар Польскіх узбр. сіл на Захадзе. Пасля вайны жыў у Лондане, адзін з кіраўнікоў польск. эміграцыі.

*У.Я.Калаткоў.*

**А́НДЭРСА А́РМІЯ**, агульнавайсковыя злучэнні польскага Лонданскага эмігранцкага ўрада ў складзе Польскіх узбр. сіл на Захадзе ў 2-ю сусв. вайну. Камандуючы ген. У.*Андэрс*. Створана на тэр. СССР у жн. 1941 — сак. 1942 як

Паўночныя Анды. Высакагорны рэльеф.



Анды на граніцы Чылі і Аргенціны.

Польская армія ў СССР паводле *польска-савецкіх пагадненняў 1941* для сумесных дзеянняў на сав.-герм. фронце. Фарміравалася ў асн. з польскіх ваеннапалонных, рэпрэсіраваных і дэпартаваных у глыб СССР жыхароў б. Зах. Беларусі і Зах. Украіны, бежанцаў з Польшчы, што апынуліся на тэр. СССР, і інш. Да жн. 1942 аператыўна падпарадкоўвалася камандаванню Чырв. Арміі, складалася з 6 пяхотных дывізій і інш. часцей і службаў (у сак. 1942 налічвала 66 тыс. чал.). У сак.—крас. і жн. 1942 са згоды Сав. ўрада эвакуіравана ў Іран і Ірак. У выніку аб'яднання з Войскам Польскім на Сярэднім Усходзе створана Польская армія на Усходзе, якая дзейнічала на тэр. Ірака. У чэрв. 1943 з яе складу вылучаны Другі польскі корпус, які ўдзельнічаў у аперацыях саюзнікаў у Паўн. Афрыцы, *Італьянскай кампаніі 1943—45*. Пасля 2-й сусв. вайны многія салдаты-беларусы з А.а. склалі частку бел. эміграцыі.

Уладзіслаў Андэрс.

*Літ.*: Прибылов В.И. Почему ушла армия Андерса // Военно-ист. журн. 1990. № 3; Климковский Е.Я был адъютантом генерала Андерса: Пер. с пол. М., 1991.

*У.Я.Калаткоў.*

**А́НДЭРСАН** (Anderson) Джэймс (1739, Шатландыя — 15.10.1808), англійскі вучоны-эканаміст. Буйны фермер. Асн. навук. працы па агр. пытанні. Прыхільнік агр. пратэкцыянізму. Задоўга да Д.Рыкарда ў асноўным правільна апісаў механізм утварэння дыферэнцыяльнай рэнты, чым абвяргаў вучэнне фізіякратаў. Рашуча выступаў супраць мальтузіянства, даказваючы, што магчымасці с.-г. вытв-сці бязмежныя, яны павялічваюцца з ростам насельніцтва.

**А́НДЭРСАН** (Anderson) Карл Дэвід (3.9.1905, Нью-Йорк — 1991), амерыканскі фізік. Чл. Нац. АН (1938). Скончыў Каліфарнійскі тэхнал. ін-т (1927), дзе і працаваў (у 1939—78 — праф.). Навук. працы па фізіцы рэнтгенаўскіх і касм. прамянёў, элементарных часціц. Адкрыў пазітрон (1932), з'яву нараджэння электронна-пазітроннай пары з гама-кванта (1933), мюон (1936) і вызначыў яго масу. Нобелеўская прэмія 1936.

**А́НДЭРСАН** (Anderson) Марыян (17.2.1902, Філадэльфія—1993), амерыканская спявачка (кантральта). Адна з буйнейшых камерных спявачак 20 ст. Дэбютавала ў канцэртах у 1925, у оперным т-ры ў 1955. Першая негрыцянка, якая выступала на сцэне т-ра «Метраполітэн-опера» ў Нью-Йорку. Валодала голасам велізарнага дыяпазону, выкон-

Ш.Андэрсан.

Х.К.Андэрсен.

вала і партыі сапрана. Мела разнастайны рэпертуар. Пакінула выканальніцкую дзейнасць у 1965. Напісала аўтабіяграфію (рус. пер. у зб. «Выканальніцкае мастацтва замежных краін». Вып. 1. М., 1962).

**А́НДЭРСАН** Мікалай Іванавіч (24.9.1845, Эстляндская губ. — 1907), вучоны-мовазнавец, гісторык навукі. Чл.-супрацоўнік Рас. геагр. т-ва (з 1889). Скончыў Тартускі ун-т (1870). У 1872—94 выкладаў стараж. мовы ў Мінскай гімназіі, у 1894—97 праф. Казанскага ун-та. Навук. працы па гісторыі фін. мовы. Аўтар кн. «Аб найстаражытнейшых школах чалавечага роду» (Мн., 1886). *В.А.Гапоненка.*

**А́НДЭРСАН** (Anderson) Філіп Варэн (н. 13.12.1923, г. Індыянапаліс, штат Індыяна, ЗША), амерыканскі фізік. Чл. Нац. АН (1967). Скончыў Гарвардскі ун-т (1943). З 1967 — праф. Кембрыджскага, з 1975 Прынстанскага ун-таў. Навук. працы па фізіцы цвёрдага цела, магнетызме, звышправаднасці, квантавай хіміі, ядз. фізіцы. Стварыў тэорыі ферамагнетызму (1950), звышправаднасці (1958), выявіў стацыянарны эфект Джозефсана (1963). Нобелеўская прэмія 1977.

**А́НДЭРСАН** (Anderson) Шэрвуд (13.9.1879, г. Камдэн, штат Агайо, ЗША — 8.3.1941), амерыканскі пісьменнік. Першы раман «Сын Уіндзі Макферсана» (1916). Вядомасць прынеслі зб-кі апавяданняў «Уайнсбург, Агайо» (1919), «Трыумф яйка» (1921), «Коні і людзі» (1923) і інш. Даследаваў уплыў індустрыялізацыі і сац. адчужэння на чалавечую псіхіку (раманы «Людзі, якія маршыруюць», 1917; «Па той бок жадання», 1932, і інш.). Пад уплывам фрэйдызму напісаны раманы «Мноства шлюбаў» (1923), «Цёмны смех» (1925). Як бескампрамісны рэаліст і праніклівы псіхолаг зрабіў уплыў на некаторых амер. пісьменнікаў 20 ст.

*Тв.*: Бел. пер. — Папяровыя шарыкі; Ніхто не ведае; Прыстойнасць; Хлусня: [Навелы] // Далягляды. Мн., 1989; Рус. пер. — Избранное. М., 1983.

**А́НДЭРСЕН** (Andersen) Ханс Крысціян (2.4.1805, г. Одэнсе, Данія — 4.8.1875), дацкі пісьменнік. Аўтар кніг «Казкі для дзяцей» (т. 1—3, 1835—37), «Новыя казкі» (1843—48), «Гісторыі» (1852—53); раманаў «Імправізатар» (1835), «Толькі скрыпач» (1837), «Дзве баранесы» (т. 1—3, 1849); зб. навел «Кніга карцін без карцін» (1840); п'ес «Мулат», «Маўрытанка» (абедзве 1840), аўтабіяграфіі «Казка майго жыцця» (1846), падарожных нарысаў. Сусв. вядомасць А. прынеслі казкі «Дзюймовачка», «Крэсіва», «Снежная каралева», «Прынцэса на гарошыне», «Новае ўбранне караля», «Брыдкае качаня», «Стойкі алавяны

Анежскае возера.

салдацік». Творчасці А. ўласцівыя рамантызм і народнасць, іронія і гумар, гуманізм і філас. мудрасць. На бел. мову казкі А. перакладалі Я.Маўр, А.Якімовіч і інш. Казка «Салавей» паст. Дзярж. т-рам лялек Беларусі (1980). 1975 быў аб'яўлены годам А.

*Тв.*: Бел. пер. — Брыдкае качаня. Мн., 1938; Выбраныя казкі. Мн., 1946; Стойкі алавяны салдацік. Мн., 1947; Казкі. Мн., 1955; Дзікія лебедзі. Мн., 1971; Рус. пер. — Сказки и истории. М., 1980.

*Літ.*: Грёнбек Бо. Ханс Кристиан Андерсен: Жизнь. Творчество. Личность: Пер. с дат. М., 1979; Переслегина Э.В. Ханс Кристиан Андерсен: Биобиблиогр. указ. М., 1979. *У.Л.Сакалоўскі.*

**А́НДЭРСЕН-НЕ́КСЁ** (Andersen Nexo; сапр. Андэрсен, псеўд. Нексё) Марцін (26.6.1869, Капенгаген — 1.6.1954), дацкі пісьменнік, прадстаўнік пралет. л-ры. Тагачаснае жыццё адлюстраваў у раманах «Пеле-Заваёўнік» (т. 1—4, 1906—10), «Дзітэ — дзіця чалавечае» (т. 1—5, 1917—21), «У жалезны век» (1929), гіст. трылогіі «Мортэн Чырвоны» (1945—48), «Страчанае пакаленне» (1948), «Жанета» (1957, незавершаны). У кн. «Вершы» (1926), зб-ках нарысаў і апавяданняў «Сонечныя дні» (1903), «Кратавінне» (т. 1—3, 1922—26), «Чорныя птушкі» (1930), «Да святла» (1938), цыкле аповесцяў «Успаміны» (1932—39), драме «Людзі з Дангорда» (1915), публіцыст. творах 1920—30-х г. абараняў ідэалы сацыялізму. У часы нам. акупацыі быў зняволены, пазней — у эміграцыі ў Швецыі і СССР. Пасля вайны вярнуўся ў Данію. Апошнія гады жыў у ГДР.

*Тв.*: Рус. пер. — Собр. соч. Т. 1—10. М., 1951—54. *У.Л.Сакалоўскі.*

**АНЕ́ГА**, гл. *Анежское возера.*

**АНЕГЕ́Р** (Honegger) Арцюр (10.3.1892, г. Гаўр — 27.11.1955), французскі кампазітар. Чл. Ін-та Францыі (1938). Буйнейшы майстар франц. музыкі 20 ст. У сваёй яркай, у многім наватарскай творчасці апіраўся на нац. традыцыі. На аснове сінтэзу элементаў розных мастацтваў стварыў новыя разнавіднасці сцэн. жанраў. З 1920-х г. працаваў пераважна ў оперна-аратарыяльным жанры (драм. араторыі «Цар Давід», 1921; «Жанна д'Арк на вогнішчы», 1935, паст. 1938, у Мінску 1971). З 1940-х г. пісаў пераважна сімф. музыку. Аўтар опер «Юдзіф» (паст. 1926), «Антыгона» (паст. 1927), «Арляня» (1937); сцэн. араторый «Крыкі свету» (1932), «Скокі мёртвых» (1938), драм. легенды «Нікала з Флю» (1941); «Каляднай кантаты» (1953); балетаў, аперэт; 5 сімфоній (1930—50); арк. твораў, у т.л. «Пасіфік 231» (1923) і «Рэгбі» (1928); канцэртаў; музыкі для т-ра, радыё і кіно. Адзін з арганізатараў і віцэ-прэзідэнт Міжнар. муз. савета, прэзідэнт Міжнар. федэрацыі і асацыяцыі аўтараў тэатр. музыкі.

*Літ. тв.*: Рус. пер. — Я — композитор. Л., 1963.

*Літ.*: Филенко Г. Онеггер // Музыка XX века: Очерки. М., 1984. Ч. 2, кн. 4.

**АНЕ́ГІН** (Onegin; сапр. Хофман; Hoffman) Сігрыд (1.6.1891, Стакгольм — 16.6.1943), нямецкая спявачка (кантральта, мецца-сапрана). Жонка рус. піяніста і кампазітара Я.Б.Львова (псеўд. Анегін). У 1912—31 салістка оперных т-раў Штутгарта, Мюнхена, Нью-Йорка («Метраполітэн-опера»), Берліна. Удзельніца Байройцкіх фестываляў. Найб. поспеху дасягнула выкананнем гал. партый у операх Р.Вагнера. Сярод інш. партый: Арфей («Арфей і Эўрыдыка» К.В.Глюка), Азучэна, Амнерыс («Трубадур», «Аіда», Дж.Вердзі).

**АНЕ́ГІН** Яўтен Яўтенавіч (н. 17.7.1932, г. Кастрама), бел. вучоны ў галіне электроннага машынабудавання. Чл.-кар. АН Беларусі (1986), д-р тэхн. н. (1982), праф. (1989). Скончыў БПІ (1950). З 1957 на Мінскім э-дзе аўтам. ліній, з 1963 у навукова-вытв. аб'яднанні «ПЛАНАР», з 1973 яго ген. дырэктар. Навук. працы па дакладным машынабудаванні для мікраэлектронікі, асновах

праектавання прэцызійнага тэхнал. абсталявання для вытв-сці інтэгральных схем. Дзярж. прэмія СССР 1973.

*Тв.*: Точное машиностроение для микроэлектроники. М., 1986; Автоматическая сборка ИС: Технол. процесс. Оборудование. Управление. Техн. зрение. Привод: Справ. пособие. Мн., 1990 (разам з В.А.Зяньковічам, Л.Р.Бітно).

**АНЕ́ГІНСКАЯ СТРАФА́**, страфа з 14 радкоў 4-стопнага ямба з рыфмоўкай АбАбВВгтДееДжж. Створана А.Пушкіным для рамана ў вершах «Яўген Анегін». У першым 4-радкоўі перакрыжаваная рыфма, у другім — сумежная, далей апаясаная. Звычайна кожная страфа мае закончаную думку і з'яўляецца «вершам у вершы», таму выкарыстоўваецца выключна ў паэт. жанрах з многапланавым развіццём сюжэта. А.с. выкарыстаў М.Лермантаў у паэме «Тамбоўская казначэйша» і інш.

**АНЕ́ЖСКАЕ ВО́ЗЕРА**, Анега, возера на ПнЗ Еўрапейскай часткі Расійскай Федэрацыі, у Карэліі, Ленінградскай і Валагодскай абласцях. Пл. 9,7 тыс. км$^2$ (без а-воў). Даўж. 256 км, шыр. каля 91,6 км, глыб. да 127 м. Пасля пабудовы Верхнясвірскай ГЭС стала вадасховішчам (9950 км$^2$). Катлавіна ледавікова-тэктанічнага паходжання. Паўн. берагі высокія, скалістыя, расчлянёныя вузкімі залівамі-губамі — Петразаводскай, Кондапажскай, Ліжэмскай і інш. і Павянецкім зал., паўднёвыя — пераважна нізкія, часта забалочаныя. 1369 а-воў агульнай пл. 250 км$^2$; найбольшыя — Вял. Клімецкі і Вял. Лелікаўскі. Т-ра паверхневых слаёў вады ў жн. ў адкрытай частцы да 20—24 °С, у залівах да 24—27 °С. Замярзае ў ліст., крыгалом у маі. Цэнтр. ч. ў асобныя гады не замярзае. На возеры назіраюцца сейшы. Празрыстаць вады да 8—9 м, каля берагоў 1—4 м. Вада прэсная, з мінералізацыяй 35 мг/л. Упадаюць 58 рэк, найб. Выцегра, Водла, Суна, Шуя; выцякае р. Свір. Каля 50 відаў рыб, 17 маюць прамысл. значэнне (сіг, рапушка, корушка, мянтуз, лешч, акунь, шчупак, ласось і інш.). Рыбалоўства. Суднаходства. Возера злучана Беламорска-Балтыйскім каналам з Белым м., Волга-Балтыйскім водным шляхам — з бас. Волгі. Уздоўж паўд. берага Анежскі суднаходны канал. На А.в. музей *Кіжы* (на аднайм. в-ве). На берагах гарады Петразаводск, Кондапага, Мядзведжагорск, Павянец.

**АНЕ́ЖСКАЯ ГУБА́**, Анежскі заліў, каля паўднёвага берага Белага м. Даўж. 185 км, шыр. 50—100 км, глыб. да 36 м. Шмат а-воў (самы вялікі Салавецкі) і камяністых меляў. Упадаюць рэкі Анега, Выг, Кем. Цячэнні моцныя, пераважна прыліўныя. Выш. прыліваў да 2,72 м. Зімой замярзае. Ледастаў у сярэднім 185 дзён. На зах. беразе каля г. Беламорск пачатак Беламорска-Балтыйскага канала. Парты: Анега, Беламорск.

**АНЕКДО́Т** (франц. anecdote ад грэч. anekdotos нявыдадзены), кароткае апавяданне жартоўнага ці сатыр. зместу пра незвычайную падзею, сітуацыю, рысу характару ці ўчынак чалавека; жанр *фальклору*. Спецыфічныя рысы А.: аднаэпізадычнасць, лаканічнасць, дакладная расстаноўка герояў, нечаканая камічная развязка. Блізкі да нар. жарту, гумарэскі.

У зах.-еўрап. народаў жанры, блізкія да А. — *фабліо*, *фацэцыя*, шванк. Тэрмін «А.» упершыню ўжыты ў Візантыі ў дачыненні да «Таемнай гісторыі» («Anekdota», 6 ст.) Пракопія Кесарыйскага. Да сярэдзіны 19 ст. да А. адносілі кароткія апавяданні пра здарэнні з вядомымі гіст. асобамі.

Бел. А. публікаваліся ў зб. П.В.Шэйна, Е.Р.Раманава, М.Федароўскага і інш., у календарах, прэсе. Народныя А. выкарыстоўвалі ў сваёй творчасці Ядвігін Ш., Я.Колас, К.Чорны, Б.Сачанка і інш. бел. пісьменнікі.

*Публ.*: Народныя ўсмешкі. Мн., 1961; Беларускія народныя жарты. Мн., 1970; Жарты, анекдоты, гумарэскі. Мн., 1984. *А.С.Фядосік.*

Анемометр чашачны.

**АНЕ́КСІЯ** (ад лац. annexio далучэнне), захоп адной дзяржавай часткі або ўсёй тэрыторыі інш. дзяржавы, а таксама гвалтоўнае ўтрыманне народнасці ў межах чужой дзяржавы. А. — грубае парушэнне міжнар. права. Статут ААН дэкларуе права нацый на самавызначэнне і абавязвае членаў ААН устрымлівацца ад А.

**АНЕЛІ́ДЫ**, гл. *Кольчатыя чэрві*.

**АНЕМА...** (ад грэч. anemos вецер), першая састаўная частка складаных слоў, якая па значэнні адпавядае слову «вецер», напр., *анемометр*, *анемахарыя*.

**АНЕМАФІЛІ́Я** (ад *анема...* + *...філія*), анемагамія, ветраапыленне, прыстасаванасць раслін да перакрыжаванага *апылення* з дапамогай ветру. Адзіны спосаб апылення ў хвойных. Характэрна таксама для многіх кветкавых раслін — злакаў, асаковых, многіх дрэвавых двухдольных раслін (бяроза, асіна, дуб, граб, ляшчына і інш.). У ветраапыляльных раслін звычайна адсутнічае або значна рэдукаваны калякветнік, шматлікія непрыкметныя кветкі сабраны ў суквецці, пазбаўлены афарбоўкі і паху, утвараюць шмат лёгкага сыпкага пылку і інш. Цвіценне часта адбываецца да разгортвання лісця.

**АНЕМАХАРЫ́Я** (ад *анема...* + *...харыя*), перанос пладоў, насення, спораў і інш. зачаткаў (дыяспораў) раслін паветр. плынямі. Асн. спосаб рассялення наземных споравых раслін, грыбоў і некаторых інш. арганізмаў. Мае значэнне і ў насенных раслін. Пры А. дыяспоры лунаюць і планіруюць, апалыя пераносяцца ветрам па паверхні глебы, вады або па шарпаку.

Дыяспоры, якія лунаюць, маюць невял. масу (споры, дробнае пылаватае насенне ятрышнікавых, заразіхавых, грушанкавых, званочкавых) або прыстасаванні накшталт парашуцікаў (чубкі на пладах астравых, на насенні скрыпнёвых, ластаўневых, вярбовых). У дыяспораў, якія планіруюць, ёсць крылападобныя прыдаткі (плады вяза, бярозы, вольхі, клёну, ясеня, насенне хвойных і інш.). Асн. маса дыяспораў разносіцца ў межах да 1 км (адзінкавыя дыяспоры дрэў у буру ці па шарпаку — да 4—10 км, споры грыбоў — часам на сотні кіламетраў).

**АНЕМІ́Я** (ад *ан...* + грэч. haima кроў) малакроўе, захворванні чалавека і жывёл, якія характарызуюцца зніжэннем колькасці гемаглабіну ў адзінцы аб'ёму крыві, часцей пры адначасовым зніжэнні колькасці эрытрацытаў. Адрозніваюць 3 асн. групы А.: ад страты крыві; пры павялічаным разбурэнні эрытрацытаў; пры парушэнні ўтварэння эрытрацытаў. Суправаджаюць А. многія захворванні, у т.л. інфекцыйныя, пры якіх у арганізме ўзнікае дэфіцыт жалеза, вітаміну $B_{12}$, фоліевай кіслаты. Могуць быць вынікам непаўнацэннага харчавання (асабліва пры недахопе ў ежы мяса). Асн. прыкметы жалезадэфіцытных А.: бледнасць скуры, галавакружэнне, галаўны боль, «мушкі» ў вачах, ломкасць валасоў і пазногцяў. А., звязаныя з вітамінаў недастатковасцю, часцей адзначаюцца ў пажылых людзей; да агульных прыкмет дадаюцца спецыфічныя — адчуванне пякоты ў языку, паносы, у запушчаных выпадках — сімптомы пашкоджання нерв. сістэмы. Пры гемалітычных набытых і спадчынных А., звязаных з павышаным разбурэннем эрытрацытаў, скура і слізістая абалонкі жаўтушныя. Усе віды А. патрабуюць неадкладнага лячэння.

**АНЕМО́ГРАФ** (ад *анема...* + *...граф*), анемарумбограф, прылада для бесперапыннага аўтам. запісу скорасці і напрамку (румбу) ветру. Адрозніваюць тыпы: чашачны А. (прыёмная частка як у *анемометра*; запісвае скорасць ветру з

дакладнасцю 0,5—1 м/с. А. манаметрычны (рэгіструе парывы ветру з дакладнасцю 0,3—0,5 м/с). Найб. дакладны А. аб'ядноўвае чашачны і манаметрычны.

**АНЕМО́МЕТР** (ад *анема...* + *...метр*), прылада для вымярэння скорасці ветру і газавых патокаў. У недыстанцыйных А. скорасць патокаў вызначаецца па скорасці вярчэння ветравога кола, вінта, крыжавіны з паўшар'ямі (А. чашачны) або па дадатным ціску (т.зв. трубка Піто), у тэрмаанемометрах — па цепладдачы нагрэтага дроту. Выкарыстоўваецца таксама аўтаматычны А. з сігнальным прыстасаваннем для выяўлення небяспечных парываў ветру і ўключэння проціаварыйных прыстасаванняў. Для бесперапыннага запісу скорасці ветру служаць *анемографы*.

**АНЕМО́НА**, гл. *Кураслеп*.

**А́НЕНКАЎ** Павел Васілевіч (1.7.1813, паводле інш. звестак 30.6.1812, Масква — 20.3.1887), рускі крытык, гісторык літаратуры, мемуарыст. Вольны слухач Пецярбургскага ун-та. У «Отечественных записках» і «Современнике» апублікаваў цыкл артыкулаў «Парыжскія пісьмы» (1847—48). Аўтар кн. «Матэрыялы для біяграфіі А.С.Пушкіна» (1853), «Пушкін у Аляксандраўскую эпоху» (1874), складальнік першага пасмяротнага збору твораў А.Пушкіна (т. 1—7; 1855—57). Найб. значную частку спадчыны А. складаюць мемуары, у т.л. кн. «Выдатнае дзесяцігоддзе (1838—1848)» (1880) — адна з асн. крыніц вывучэння літ. думкі і грамадскага руху 1830—40-х г.

*Тв.*: Воспоминания и критические очерки 1849—1868. Т. 1—3. Спб., 1877—81; Литературные воспоминания. М., 1983.

**А́НЕНКАЎ** Юрый Паўлавіч (23.7.1889, Петрапаўлаўск-Камчацкі — 3.5.1974), рускі жывапісец і графік. Вучыўся ў вучылішчы А.Штыгліца ў Пецярбургу (1909—11), у Ф.Валатона і М.Дэні ў Парыжы (1911—12). Аўтар вострахарактарных партрэтаў, часта з элементамі гратэску. Адзін з заснавальнікаў сав. кніжнай ілюстрацыі («Дванаццаць» А.Блока, 1918). Мастак тэатра і кіно. Выпрабаваў шэраг кірункаў мастацтва 1-й чвэрці 20 ст., у т.л. кубізм. З 1924 за мяжой (Германія, Францыя). Напісаў «Дзённік маіх сустрэч» (рус. пер. 1991).

**А́НЕНСКІ** Інакенцій Фёдаравіч (1.9.1856, г. Омск — 13.12.1909), рускі паэт. Скончыў Пецярбургскі ун-т (1879). Аўтар трагедый «Меланіпа-філосаф» (1901), «Цар Іксіён» (1902), «Лаадамія» (1906), «Фаміра-кіфарэд» (выд. 1913), заснаваных на сюжэтах ант. міфалогіі. Паэзіі А. (зб-кі «Ціхія песні», 1904; «Кіпарысавая шкатулка», 1910; «Пасмяротныя вершы» 1923) уласцівыя дэкадэнцкае светаўспрыманне, адзінства інтэлектуальных і маральных пачаткаў. Выступаў як перакладчык і крытык («Кніга адлюстраванняў», т. 1—2, 1906—09).

**А́НЕНСКІ** Ісідар Маркавіч (13.3.1906 — 2.5.1977), расійскі кінарэжысёр, сцэнарыст. Засл. дз. маст. Расіі (1971). Скончыў Ін-т тэатр. мастацтва (1934), Усесаюзны ін-т кінематаграфіі ў Маскве (1936).

Сярод фільмаў: экранізацыі твораў А.Чэхава «Мядзведзь» (1938), «Чалавек у футарале» (1939; абодва на кінастудыі «Беларусьфільм»), «Ганна на шыі» (1954), а таксама «Пяты акіян» (1940), «Княжна Мэры» (1955), «Таленты і паклоннікі» (1973) і інш.

**АНЕРО́ІД** (ад *а...* + грэч. nēros вільготны + eidos від), прылада для вымярэння атм. ціску. Асн. дэталь — метал. скрыначка, унутры якой вакуум. Пры павышэнні ціску яна сціскаецца, што праз злучаную з ёю спружыну выклікае зрушэнне стрэлкі на шкале. Адчувальнасць да 10 Па. Для атрымання сапраўднага значэння ціску ў паказанні А. ўводзяць папраўкі, якія вызначаюцца пры параўнанні з данымі ртутнага *барометра*. Выкарыстоўваецца таксама як вышынямер (напр., у авіяцыі; шкалу А. градуіруюць у метрах).

Анероід: 1 — металічная скрыначка; 2 — стрэлка; 3 — шкала.

Схема анеўплаідыі.

**АНЕ́ТА** (Aneto), Піка-дэ-Анета, самая высокая вяршыня Пірэнеяў, у Іспаніі. Выш. 3404 м. Размешчана ў гранітным масіве Маладзета. Снежнікі і невял. ледавікі.

**АНЕЎПЛАІДЫ́Я** (ад *ан...* + грэч. eu добра, цалкам + ploos кратны + eidos від), гетэраплаідыя, спадчынная змена, пры якой клеткі арганізма маюць колькасць *храмасом*, не кратную адзінарнаму (гаплоіднаму) набору. Адсутнасць у храмасомным наборы дыплоіда адной храмасомы наз. манасоміяй, дзвюх гамалагічных храмасом — нулісоміяй; наяўнасць дадатковай гамалагічнай храмасомы — трысоміяй. Арганізмы з анамальнай колькасцю храмасом наз. адпаведна манасомікамі, нулісомікамі, трысомікамі. Асн. механізм узнікнення А.— неразыходжанне і страта асобных храмасом у мітозе і меёзе. А. звычайна прыводзіць да паніжэння жыццяздольнасці і нярэдка да гібелі анеўплоідаў, асабліва ў жывёл. Прыкладам А. ў чалавека з'яўляецца *Даўна хвароба*, якая выклікаецца трысаміяй па 21-й храмасоме. З дапамогай А. пры генет. аналізе вызначаюць лакалізацыю генаў у храмасомах.

**АНЕЎРЫ́ЗМА** (ад грэч. aneurysma расшырэнне), абмежаванае расшырэнне крывяноснага сасуда ці поласці сэрца пры станчэнні і выпучванні яго сценкі.

**АНЕСТЭ́ЗІЯ**, гл. ў арт. *Абязбольванне*.

**АНЕСТЭЗІЯЛО́ГІЯ** (ад *ан...* + грэч. aisthēsis пачуццё + *...логія*), галіна клінічнай медыцыны, якая вывучае праблемы *абязбольвання*, кіравання жыццёваважнымі функцыямі арганізма ў час хірургічнай аперацыі, а таксама перад пачаткам і пасля яе. Уключае *рэаніматалогію* і інтэнсіўную тэрапію.

Метады абязбольвання пачалі распрацоўвацца разам з хірургіяй яшчэ ў Стараж. Асірыі, Егіпце, Кітаі, Індыі і інш. краінах. Як абязбольвальныя сродкі выкарыстоўваліся настоі і адвары маку, індыйскіх канапель, мандрагоры, дурнап'яну. У сярэднявеччы абязбольванне дасягалася таксама сціскáннем сасудаў шыі або канечнасцяў, шчодрым кровапусканнем, ахаладжэннем тканак і інш. У 19 ст. адкрыты эфектыўныя спосабы абязбольвання. Англ. ўрач У.Мортан у 1846 правёў аперацыю пад эфірным наркозам, у 1844 амер. ўрач Х.Уэлс выкарыстаў закіс азоту пры выдаленні зуба. У 1847 шатландскі ўрач Дж.Сімпсан у якасці сродку для наркозу прапанаваў хлараформ. У Расіі эфірны і хлараформны наркоз увялі ў практыку М.І.Пірагоў і Ф.І.Іваземцаў (1847). Прыцыпова новым метадам анестэзіі было адкрыццё мясцова-анестэзоўнага дзеяння какаіну (рус. ўрач В.К.Анрэп, 1879; аўстр. Келер, 1884). З увядзеннем у практыку растворaў навакаіну пачало хутка развівацца мясц. абязбольванне: інфільтрацыйная, правадніковая і спіннамазгавая анестэзія (А.В.Вішнеўскі, С.С.Юдзін, І.С.Жораў, Я.М.Мяшалкін і інш.).

На Беларусі сістэматычныя даследаванні па А. пачаліся ў канцы 1950 — пач. 1960 г. у Бел. ін-це ўдасканалення ўрачоў, мед. ін-тах. Вывучаюцца праблемы эндатрахеяльнага наркозу, камбінаванай анестэзіі, асаблівасцяў абязбольвання пры розных хірург. умяшаннях. Распрацоўваюцца пытанні штучнай вентыляцыі лёгкіх, артэрыяльнай гіпатэнзіі, гіпа- і гіпертэрміі (В.К.Зубовіч, І.І.Канус, І.З.Кляўзунік, А.А.Плавінскі, У.У.Спас, І.З.Столкарц, П.В.Цэдрык і інш.). Створана служба анестэзіялогіі — рэаніматалогіі з палатамі інтэнсіўнай тэрапіі.

*Літ.*: Бунятян А.А., Рябов Г.А., Маневич А.З. Анестезиология и реаниматология. 2 изд. М., 1984; Руководство по анестезиологии. М., 1994. *І.І.Канус.*

Адрозніваюць А. сапраўдныя, калі выпучваюцца ўсе слаі сценак, і несапраўдныя — анеўрызматычны мяшок фарміруецца пры сценцы пашкоджанага сасуда. А. сасудаў (артэрыяльныя, вянозныя, артэрыявянозныя) і аорты з'яўляюцца ўскладненнямі атэрасклерозу, сіфілісу, раненняў і інш. хвароб. А. сэрца ўзнікае пасля інфаркту ў сценцы левага жалудачка. А. могуць парушаць кровазабеспячэнне і сціскаць прылеглыя тканкі. Магчымы разрывы А. і крывацёкі са смяротным зыходам. Лячэнне спецыяльнае (асн. хваробы) і хірургічнае (траўматычныя А.).

**АНЕ́ЦІ** (Onetti) Хуан Карлас (н. 1.7.1909, г. Мантэвідэо, Уругвай), уругвайскі пісьменнік, адзін з заснавальнікаў новай лац.-амер. прозы. На пачатку творчасці зазнаў уплыў філасофіі экзістэнцыялізму. Аўтар зб-каў апавяданняў «Самае жахлівае пекла» (1962), «Сумная, як яна» (1963), аповесцяў «Калодзеж» (1939), «Для адной безыменнай магілы» (1959), раманаў «Нічыйная зямля» (1941), «Кароткае жыццё» (1950), «Верф» (1961), «Хунта кадаверэс» (1964), «Дадзім слова ветру» (1978), «У тыя часы» (1987) і інш. Паўфантастычныя сюжэтныя сітуацыі ў творах А. часам набываюць сімвалічнае гучанне; з глыбокім псіхалагізмам даследуе пачуццё бяссілля, прыгнечанасці, працэс разрыву герояў з рэчаіснасцю варожага свету. Прэмія М.Сервантэса (1980).

*Тв.*: Obras completas Mexico, 1970; Рус. пер. — Короткая жизнь. Верфь: Романы; Повести и рассказы. М., 1983. *Х.-К.Папок.*

**АНЁЛЫ** (ад грэч. angelos вястун), у хрысціянстве, іудаізме, ісламе бесцялесныя звышнатуральныя істоты, створаныя Богам; пасрэднікі паміж Богам і людзьмі праз якіх ён абвяшчае людзям сваю волю. Паводле прынятай у хрысціянстве «нябеснай іерархіі», А. падзяляюцца на 9 чыноў, згрупаваных у 3 абліччах: серафімы, херувімы, прастолы; панавання, сілы і ўлады; пачаткі, анёлы і архангелы. Паводле ўяўленняў веруючых, да кожнага чалавека ад нараджэння Бог прыстаўляе асобнага А.-ахоўніка.

**АНЖУ́** (Anjou), гістарычная вобласць на ПнЗ Францыі, у бас. Ніжняй Луары. Пл. 7,6 тыс. км$^2$. Нас. 680 тыс. чал. (1982). Уключае дэпартаменты Мен і Луара, часткова Эндр і Луара, Маен, Сарта. Гал. горад — Анжэ.

**АНЖУ́** Пётр Фёдаравіч (15.2.1796, Вышні Валачок, Расія — 12.10.1869), даследчык Арктыкі, адмірал рус. флоту. У 1821—23 з памочнікамі апісаў паўн. берагі і а-вы паміж рэкамі Алянёк і Індыгірка, склаў карту Новасібірскіх а-воў. У 1825—26 удзельнічаў у апісанні паўн.-ўсх. берага Каспійскага м. і зах. берага Аральскага м. У 1827 вызначыўся ў Наварынскай бітве руска-англа-франц. флоту з тур.-егіп. флотам на лінейным караблі «Гангут». Займаў камандныя пасады ў марскім ведамстве. Імем А. названа паўн. група Новасібірскіх а-воў.

*Літ.*: Пасецкий В.М. Петр Анжу. М., 1958.

**АНЖУ́ АСТРАВЫ́**, цэнтральныя, самыя вял. астравы ў архіпелагу Новасібірскія а-вы ў м. Лапцевых і Усходне-Сібірскім м. Уключаюць а-вы: Кацельны, Зямля Бунге, Фадзееўскі, Новая Сібір і Бяльковскі. Агульная пл. каля 29 тыс. км$^2$. У рэльефе пераважаюць нізінныя акумулятыўныя раўніны, занятыя арктычнымі тундрамі. Названы імем рус. палярнага даследчыка П.Ф.*Анжу*.

**АНЖУ́ЙСКАЯ ДЫНА́СТЫЯ**, каралеўская дынастыя ў шэрагу еўрапейскіх краін сярэднявечча. Паходзіла ад франц. графаў Анжу. Правіла ў Англіі ў 1154—1399 (гл. *Плантагенеты*), у Паўд. Італіі ў 1268—1442, Сіцыліі ў 1268—82 (намінальна ў 1266—1302). Заснавальнік дынастыі ў Сіцыліі і Паўд. Італіі Карл Анжуйскі (правіў да 1285)



Схема **анізаметра магнітнага**: 1 — крыніца святла; 2 — пругкія элементы; 3 — люстэрка; 4 — шкала; 5 — узор; *N*, *S* — полюсы магніта.

Правіла таксама ў Венгрыі ў 1308—87 і ў Польшчы ў 1370—82 і 1384—85.

**АНЖЭ́РА-СУ́ДЖАНСК**, горад у Расіі, у Кемераўскай вобл. Засн. ў 1897. 104,8 тыс. ж. (1994). Чыг. станцыя (Анжэрская). Цэнтр вугальнай прам-сці Кузбаса. Машынабудаванне і металаапрацоўка (буд. машыны, горназдабыўное абсталяванне, трактарныя агрэгаты і інш.); хім.-фармацэўтычная, лёгкая, харч. прам-сць; вытв-сць буд. матэрыялаў (жалезабетонныя вырабы, шкло).

**А́НЗЮС** (ANZUS; Australia, New Zealand, United States), ваенна-палітычны блок Аўстраліі, Новай Зеландыі і ЗША. Назва ад першых літар краін-удзельніц. Дагавор пра стварэнне блока падпісаны 1.9.1951 у Сан-Францыска (ЗША) на неабмежаваны тэрмін, уступіў у сілу 29.4.1952. Інспіраваны ЗША, якія пасля пачатку Карэйскай вайны (1950) імкнуліся стварыць на ўзор НАТО калект. саюз бяспекі ў ціхаакіянскай прасторы. Прадугледжваў узаемную падтрымку ў выпадку нападу на аднаго з партнёраў. Аўстралія і Новая Зеландыя бачылі ў дагаворы гарантыю бяспекі ад Японіі. Пасля закрыцця новазеландскіх партоў для атамных ваен. караблёў ЗША (1985) амер. ўрад у 1986 абвясціў пра спыненне сваіх абавязкаў у адносінах да Новай Зеландыі, яе членства ў АНЗЮСе прыпынена.

**АНІ́ВА**, заліў Ахоцкага м., каля паўд. берага в. Сахалін, паміж п-авамі Крыльёнскім і Таніна-Аніўскім. Даўж. 90 км, шыр. 104 км, глыб. да 93 м. Шырока адкрыты ў паўд.-зах. частку Ахоцкага м. Багаты рыбай (ласасёвыя, селядцы, траска, камбала). На беразе — гарады Аніва, Карсакаў.

**АНІГІЛЯ́ЦЫЯ** (ад лац. annihilatio знішчэнне, знікненне), працэс узаемадзеяння элементарнай часціцы з яе *антычасціцай*, у выніку якога яны ператвараюцца ў інш. *элементарныя часціцы*. Адбываецца ў адпаведнасці з *захаванняў законамі*. А. электронна-пазітроннай пары ($e^- — e^+$) у 2 або 3 фатоны і адваротны працэс нараджэння яе фатонамі былі прадказаны англ. фізікам П.Дзіракам (1931), выяўлены эксперыментальна франц. фізікамі І. і Ф.Жаліо-Кюры (1933) і дакладна апісаны ў *квантавай электрадынаміцы*. У фізіцы высокіх энергій А. — адзін з імаверных каналаў (прамежкавых стадый) працэсаў узаемадзеяння часціцы з антычасціцай, што ажыццяўляецца за кошт электрамагн., слабага і моцнага ўзаемадзеянняў. Напр., пры сутыкненнях высокаэнергет. ($e^- — e^+$) пучкоў акрамя А. ў фатоны магчымы пругкае і няпругкае рассеянне, ператварэнне ў інш. пары ($\mu^- — \mu^+$, $\nu — \tilde{\nu}$, $\pi — \pi^+$ і г.д.), утварэнне звязаных недаўгавечных сістэм (пазітроній, кварконій і інш.) або абсалютна нейтральных часціц ($\gamma$, p, $\eta^0 \rightarrow$ ), а ў канчатковым выніку — множнае нараджэнне часціц, пераважна *адронаў*. Сучасныя паскаральнікі на сустрэчных пучках даюць магчымасць атрымаць усе вядомыя элементарныя часціцы, у т.л. самыя масіўныя, напр. слабыя базоны $w^{(-)}$, $w^{(+)}$, $z^{(0)}$.

*Літ.*: Богуш А.А. Очерки по истории физики микромира. Мн., 1990. *А.А.Богуш.*

**АНІ́Д**, гл. ў арт. *Поліамідныя валокны*.

**АНІЁН**, гл

**АНІЗАГА́МІЯ** (ад грэч. anisos неаднолькавы + *...гамія*), тып палавога працэсу, калі зліваюцца палавыя клеткі (*гаметы*), якія адрозніваюцца памерам, формай або паводзінамі пры зліцці. Напр., у некаторых водарасцяў А. заключаецца ў зліцці мужчынскіх і жаночых гамет, адна з якіх менш рухомая або большая за другую. Часам гэты працэс наз. *гетэрагаміяй*, а паняцце «А.» выкарыстоўваюць у адносінах да прасцейшых, якім у палавым працэсе ўласцівы *капуляцыя* і *кан'югацыя*. Для вышэйшых раслін і многаклетачных жывёл, а таксама для некаторых грыбоў характэрна *аагамія*. Гл. таксама *Ізагамія*.

**АНІЗАМЕ́ТР МАГНІ́ТНЫ** (ад грэч. anisos неаднолькавы + *...метр*), прылада

для вызначэння *магнітнай анізатрапіі* монакрышталёў і тэкстураваных матэрыялаў. Прынцып дзеяння: доследны ўзор змяшчаюць у моцнае аднароднае магн. поле; папярочная кампанента вектара намагнічанасці, што ўзнікае, ўтварае момант вярчэння, які імкнецца павярнуць узор. Момант вярчэння кампенсуецца момантам, што ствараюць

А.А.Анікейчык.

пругкія мех. элементы прылады. Вугал павароту ўзору адлічваецца па шкале пры розных напрамках поля. Па выніках вымярэнняў разлічваюцца канстанты анізатрапіі і ацэньваецца ступень дасканаласці тэкстуры. А.м. дае магчымасць даследаваць масіўныя ўзоры, ферамагн. плёнкі, матэрыялы ў вытв. умовах; інтэрвал т-р ад 1300 K да геліевых (~1K); напружанасць магн. поля да 4000 кА/м.

**АНІЗАТРАПІ́Я** (ад грэч. anisos неаднолькавы + tropos напрамак), 1) у ф і з і ц ы — залежнасць фіз. (мех., аптычных, магн. і інш.) уласцівасцяў рэчыва ад напрамку. Натуральная А. — характэрная асаблівасць крышталёў; абумоўлена іх сіметрыяй і выяўляецца тым больш, чым яна меншая. А. некаторых вадкасцяў (напр., вадкіх крышталёў) тлумачыцца асіметрыяй і пэўнай арыентацыяй малекул. У аморфных і полікрышталічных рэчывах А. бывае пры наяўнасці прыроднай (напр., драўніна) або штучнай тэкстуры (напр., пры пракатцы ліставой сталі зерні металу арыентуюцца ўздоўж напрамку пракаткі, у выніку чаго ствараецца А. мех. уласцівасцяў). А. многіх уласцівасцяў крышталёў, напр. лінейнага цеплавога расшырэння, электраправоднасці, пругкіх уласцівасцяў, характарызуецца значэннямі адпаведных пастаянных уздоўж гал. восі сіметрыі і ўпоперак да яе.

Аптычная А. выяўляецца ў выглядзе *падвойнага праменепераламлення*, *дыхраізму*, змен характару палярызацыі і вярчэння плоскасці палярызацыі святла. Натуральная аптычная А. крышталёў абумоўлена неаднолькавасцю ў розных напрамках поля сіл, якія ўтрымліваюць атамы ці іоны рашоткі. Штучная А. ствараецца ў ізатропных асяроддзях пад уздзеяннем вонкавых сіл ці палёў, што вызначаюць у асяроддзях пэўныя напрамкі, напр., у выніку ўздзеяння пругкіх дэфармацый, эл. поля, магн. поля (гл. *Катона—Мутона эфект*, *Фарадэя эфект*). 2) А. ў г е а л о г і і абумоўлена мікраслаістасцю, упарадкаванай арыентацыяй зерняў і крышталёў і мікратрэшчынаватасцю горных парод і мінералаў. Крышталі розных мінералаў выяўляюць А. розных уласцівасцяў: слюды — аптычных, мех. (спайнасці, пругкасці, трываласці); дыстэну — цвёрдасці; кварцу, турмаліну — аптычных, п'езаэлектрычнага эфекту; магнетыту — ферамагнітных; кальцыту — аптычных. А. некаторых мінералаў выкарыстоўваецца ў прыладабудаванні. А. масіваў горных парод вызначаецца ўпарадкаванымі лінейнымі ці плоскаснымі элементамі будовы (стратыфікаваныя асадкавыя і метамарфічныя тоўшчы горных парод з лінейна арыентаванымі структурамі, слаістасцю, макратрэшчынаватасцю і інш.). Пры горных работах найб. значэнне маюць дэфармацыйныя

А.Анікейчык. Сны пра Радзіму. М.Багдановіч. 1981.

ўласцівасці парод. 3) У б а т а н і ц ы — здольнасць розных органаў адной і той жа расліны займаць рознае становішча пры аднолькавым ўздзеянні пэўнага фактара вонкавага асяроддзя. Напр., пры бакавым асвятленні расліны яе верхавінка выгінаецца ў бок крыніцы святла, а лісцевыя пласцінкі займаюць перпендыкулярнае напрамку прамянёў становішча.

*Літ.*: Ш а с к о л ь с к а я М.П. Очерки о свойствах кристаллов. 2 изд. М., 1978; С и р о т и н Ю.И., Ш а с к о л ь с к а я М.П. Основы кристаллофизики. 2 изд. М., 1979.

**АНІЗАТРО́ПНЫЯ МАТЭРЫЯ́ЛЫ**, матэрыялы, уласцівасці якіх (мех., фіз. і інш.) неаднолькавыя па розных напрамках унутры гэтых матэрыялаў (гл. *Анізатрапія*). Да А.м. адносяцца монакрышталі, валакністыя і плёначныя матэрыялы, жалезабетон, пластмасы са слаістымі напаўняльнікамі (гетынакс, тэксталіты, шкло- і вугляпластыкі і інш.), кампазіцыйныя матэрыялы. Выкарыстанне А.м. скарачае расход матэрыялаў і паляпшае якасць канструкцый. Напр., трансфарматары са стрыжнямі з анізатропнай тэкстураванай сталі прыкладна на 20—40% лягчэйшыя за трансфарматары са стрыжнямі з гарачакачанай звычайнай сталі.

**АНІ́ЙСКАЕ ЦА́РСТВА**, армянская феад. дзяржава (860—1045) са сталіцай у г. Ані (зараз Турцыя). Узнікла ў выніку аб'яднання Арменіі *Багратыдамі* і вызвалення ад улады Арабскага халіфата. Найбуйнейшае сярод феад. дзяржаў сяродневяковай Арменіі, аб'ядноўвала яе большую частку. Высокага ўзроўню развіцця дасягнулі ў А.ц. рамёствы і гандаль, навука, архітэктура, л-ра і мастацтва. Узмацненне феад. эксплуатацыі выклікала антыфеад. нар. рух *тандракійцаў*. У 10 ст. ў выніку феад. раздробленасці ў А.ц. ўтварылася некалькі царстваў — васалаў Багратыдаў. У 1045 заваявана Візантыяй.

**АНІКАВІЦКІ БАНДА́РНА-ЛЕСАПІ́ЛЬНЫ ЗАВО́Д**. Дзейнічаў на Беларусі ў в. Анікавічы (Горацкі р-н Магілёўскай вобл.). Выраблялі бочкі, пілаваны лес. У 1908 меў лакамабіль, працавалі 96 чал. У 1910—13 былі 2 лакамабілі.

**АНІКЕ́ЕЎ** Саўка, майстар разьбярскай і сталярскай справы 2-й пал. 17 ст. Паходзіў з Беларусі. Працаваў у Аружэйнай палаце Маскоўскага Крамля. У 1684 разам з інш. майстрамі-беларусамі рабіў крэслы, куфэркі, сталы для царскага двара.

**АНІКЕ́ЙЧЫК** Анатоль Аляксандравіч (11.7.1932, г. Барысаў — 3.2.1989), бел. скульптар, педагог. Нар. мастак Беларусі (1972). Праф. (1981). Скончыў Бел. тэатр. маст. ін-т (1959; вучань А.А.*Бембеля* і А.К.*Глебава*), выкладаў (з 1978) у гэтым ін-це. Працаваў у галіне манум. і станковай скульптуры. Для яго творчасці характэрна імкненне да гісторыка-рамант. трактоўкі тэм і вобразаў: помнікі землякам, што загінулі ў Вял. Айч. вайну ў в. Хвойнікі Чэрвеньскага р-на (1967), М.Ф.Гастэлу і яго экіпажу каля г.п. Радашковічы Маладзечанскага р-на (1976), А.М.Матросаву ў в. Чарнушкі на Пскоўшчыне (1978, у сааўт.); фантаны «Юнацтва» каля касцёла на пл. Незалежнасці і «Купалінкі» ў парку імя Я.Купалы ў Мінску (1972). Стварыў значныя творы на тэму Вял. Айч. вайны — мемарыялы «*Прарыў*», «*Праклён фашызму*». Вял. месца ў творчасці А. займаў вобраз Я.Купалы: надмагілле паэта (1971, з А.Заспіцкім) на Вайсковых могілках у Мінску, помнікаў у Мінску (1972, з Л.Гумілеўскім, Заспіцкім; Дзярж. прэмія Беларусі 1974), у Ляўках Аршанскага р-на (1982), бронзавы бюст (1973) у Араў-парку ў Нью-Йорку, кампазіцыя «Восень паэта» (1980). Стварыў

кампазіцыю «Сны пра Радзіму. М.Багдановіч» (1981), партрэты Л.Бетховена (1968), П.М.Машэрава, кампазітара Л.Гідравічуса (абодва 1980), Г.Ахматавай (1982); надмагіллі С.В.Прытыцкага (1975), М.Лынькова (1978), П.М.Машэрава (1983), У.Караткевіча (1986). Прэмія Ленінскага камсамола Беларусі 1967.

*Літ.:* Крэпак Б.А. А.А.Анікейчык. Мн., 1980. *Э.А.Петэрсон.*

**АНІКІЕ́ВІЧ** Кірыла Цімафеевіч, бел. краязнавец, археолаг і этнограф 2-й пал. 19 — пач. 20 ст. Скончыў Полацкую настаўніцкую семінарыю. Працаваў настаўнікам нар. вучылішчаў у Магілёўскай і Віцебскай губ. Вывучаў побыт сялян, збіраў фальклор, вёў археал. раскопкі. Быў карэспандэнтам Е.Р.*Раманава.* Асн. праца «Сенненскі павет Магілёўскай губерні» (Магілёў, 1907), у якой даў геагр., гіст., эканам. і этнагр. характарыстыкі Сенненшчыны, апісаў жыллё, адзенне, сямейнае і грамадскае жыццё сялян, заняткі насельніцтва і інш.

**АНІ́КІН** Віктар Іванавіч (н. 14.1.1918, г. Алатыр, Чувашыя), бел. архітэктар, вучоны. Засл. арх. Беларусі (1980). Канд. архітэктуры (1970), праф. (1984). Скончыў Ленінградскі ін-т інжынераў камунальнага буд-ва (1940). У 1946—58 працаваў у Вільні (рэсп. стадыён, мост цераз р. Нярыс, будынак Дзярж. б-кі). З 1958 у Мінску. Асн. работы на Беларусі: генпланы Светлагорска, Пінска, цэнтра Брэста, у Мінску — жылыя раёны і мікрараёны Усход, Серабранка, вул. Чкалава (усе ў аўтарскім калектыве), гал. навуч.-лабараторны корпус арх. і буд. ф-таў БПА (у сааўт.) і інш.

*Тв.:* Архитектурное проектирование жилых районов. Мн., 1987; Градостроительство Белоруссии. Мн., 1988 (у сааўт.).

**АНІКУ́ШЫН** Міхаіл Канстанцінавіч (н. 2.10.1917, Масква), рускі скульптар. Нар. мастак СССР (1963). Правадзейны чл. АМ СССР (1962). Герой Сац. Працы (1977). Скончыў Ін-т жывапісу, скульптуры і архітэктуры ў Ленінградзе (1947). Аўтар помнікаў А.С.Пушкіну (1957; Ленінская прэмія 1958), У.М.Бехцераву (1960), скульптур да мемарыяла «Гераічным абаронцам Ленінграда» (1975, у сааўт.; усе ў С.-Пецярбургу), станковых партрэтаў («А.П.Чэхаў», 1964) і інш.

*Літ.:* Прибульская Г. Аникушин. Л.; М., 1961.

**АНІЛІ́Н**, амінабензол, феніламін, найпрасцейшы араматычны амін, $C_6H_5NH_2$. Бясколерная вадкасць, $t_{кіп}$ 184,4 °С, шчыльн. $1{,}02 \cdot 10^3$ кг/м$^3$; растваральны ў вадзе, спіртах, эфірах. Мае ўласцівасці асноў, з мінер. кіслотамі ўтварае солі. Асн. метад атрымання А. — аднаўленне нітрабензолу (упершыню атрыманы з індыга). Выкарыстоўваюць у вытв-сці фарбавальнікаў, фотаматэрыялаў, выбуховых рэчываў, лекаў, паскаральнікаў вулканізацыі каўчуку і інш. Ядавіты (дзейнічае на ц.н.с., выклікае дэгенерацыю эрытрацытаў крыві, гемаліз), ГДК 0,1 мг/м$^3$.

**АНІЛІ́НАВЫ ЧО́РНЫ**, азінавы фарбавальнік. Утвараецца ў выніку акіслення *аніліну* ў кіслым асяроддзі звычайна непасрэдна на валокнах бавоўны, шоўку, футра. Устойлівы да кіслотаў, атм. уздзеянняў, святла. Акісленнем аніліну атрымліваюць таксама чорны пігмент, які выкарыстоўваецца для афарбоўкі пластмасаў, у вытв-сці лакафарбавых матэрыялаў, фарбы для капіравальнай паперы, стужак друкавальных машынак і інш.

**АНІЛІНАФА́РБАВАЯ ПРАМЫСЛО́ВАСЦЬ**, гл. ў арт. *Сінтэтычных фарбавальнікаў прамысловасць.*

**АНІЛІ́НГУС** (ад лац. anus задні праход + lingo лізаць), анілінкцыя, варыянт папярэдніх інтымных ласкаў у час любоўнай прэлюдыі, пры якой палавое ўзбуджэнне дасягаецца праз раздражненне заднепраходнай вобласці пар-

М.Анікушын. А.П.Чэхаў. 1964. Нацыянальны мастацкі музей Беларусі.

тнёра языком і губамі. У вышэйшых жывёл А. — звычайная з'ява ў перыяд шлюбных гульняў і падрыхтоўкі да злучкі.

**АНІМАЛІСТЫ́ЧНЫ ЖАНР** (ад лац. animal жывёла), жанр выяўленчага мастацтва і літаратуры, творы якога адлюстроўваюць жывёльны свет; спалучае прыродазнаўчую і маст. аснову. У выяўленчым мастацтве пашыраны ва ўсіх відах: жывапісе, скульптуры, графіцы, дэкар. мастацтве.

Прыкметы А.ж. мае першабытнае мастацтва: малюнкі жывёл на сценах пячор, дробная пластыка. У 1-м тыс. да н.э. ў мастацтве скіфаў склаўся т.зв. «звярыны стыль». У Стараж. Егіпце сімвалічныя манум. вобразы жывёл. Анімалістычны кампанент сустракаецца ў ант. скульптуры, мазаіках і вазапісе; пашыраны ў рэльефах, мініяцюрах і станковых кампазіцыях Кітая (7—13 ст.), рэльефах Індыі (7 ст.), мазаіках, фрэсках і ўжытковым мастацтве Ірака, Сірыі і Палесціны (8—9 ст.). У еўрап. мастацтве Адраджэння практыкаваліся натурныя замалёўкі жывёл, іх выявы сустракаюцца ў фрэсках і станковых карцінах Пізанела, Леанарда да Вінчы, А.Дзюрэра; найб. яскрава праявіўся ў жывапісе Галандыі. Сярод анімалістаў 17—18 ст. А.Кёйп, П.Потэр (Галандыя), Ф.Снайдэрс, Я.Фейт (Фландрыя), Ж.Б.Удры (Францыя), І.Ф.Грост (Расія), Маруяма Окія (Японія). У 19—20 ст. у А.ж. заявілі пра сябе К.Труаён, А.Л.Бары (Францыя), Ф.Марк, А.Гаўль (Германія), Б.Лільефорс (Швецыя), К.Томсен (Данія), А.Сцяпанаў, П.Клот, Я.А.Лансерэ, В.Ватагін (Расія), Моры Сосэн (Японія), Сюй Бэй-Хун (Кітай).

На Беларусі стылізаваныя выявы жывёл сустракаюцца ў мегалітычных знаходках. Да перыяду неаліту адносяцца надзвычай рэаліст. творы дробнай пластыкі (крамянёвыя і гліняныя скульптуры звяроў, птушак). У 16—17 ст. выявы жывёл адлюстраваны ў мініяцюрах і гравюрах (гравюры ў Бібліі Ф.Скарыны «Самсон і Леў», «Данііл з ільвамі»), кніжнай ілюстрацыі (іл. Т.Макоўскага да кн. К.Дарагастайскага «Гіпіка», 1620). У мастацтве 20 ст. А.ж.

Да арт. Анімалістычны жанр. М.Звярко. Леў. 1970-я г.

Да арт. Анімалістычны жанр. Г.Лойка. Совы. Сангіна, вугаль. 1974.

Да арт. Анімалістычны жанр. Л.Главацкая. Певень. 1976.

прадстаўлены станковымі творамі В.Ціхановіча, Г.Лойкі, Т.Стагановіч. Анімалістыку выкарыстоўваюць у сваёй творчасці ілюстратары дзіцячых кніг (Ю.Зайцаў, Я.Кулік, А.Лось, Н.Паплаўская і інш.), мастакі дэкар.-прыкладнога і нар. мастацтва (В.Альшэўскі, Л.Багданаў, Р.Багінскі, В.Гаўрылаў, Л.Главацкая, У.Жохаў, М.Звярко, Г.Лінкевіч, В.Луцэнка, І.Пухоўскі, Дж.Сакажынскі).

У літаратуры жывёльны эпас вядомы са стараж. часоў і існуе ва ўсіх народаў свету — стараж.-грэч. паэма 6—5 ст. да н.э. «Вайна мышэй і жаб», паданні ў інд. зб. «Панчатантра», сярэдневяковыя франц., ням., нідэрл. і інш. казкі. На Беларусі самыя стараж. творы А.ж. — казкі пра жывёл. Праз алегарычныя вобразы жывёл у іх раскрываюцца разнастайныя праявы ўзаемаадносін і характараў, уласцівыя людзям: смеласць і баязлівасць, адданасць і здрада, бескарыслівасць і прагнасць. Элементы А.ж. ёсць у творах стараж. л-ры («Песня пра зубра» М.Гусоўскага), л-ры 19—20 ст. (алегарычныя вобразы лісіцы і гадзюкі-мядзянкі ў паэме «Кепска будзе» Ф.Багушэвіча, жорава ў апавяд. «Міхаська» Цёткі). Выдатныя ўзоры А.ж. стварылі Я.Колас (раздзел «Воўк» у паэме «Новая зямля»), Э.Самуйлёнак («Паляўнічае шчасце»), К.Крапіва (байкі) і інш. Асабліва пашыраны гэты жанр у л-ры для дзяцей («Вавёрчына гора» В.Віткі, «Дзед і Жораў» В.Вольскага).

Да арт. Анімалістычны жанр. Т.Стагановіч. Чыкары (сям'я рыжай вавёркі). 1963.

*Літ.*: Ватагин В.А. Изображение животного. М., 1957.

*М.Л.Цыбульскі, М.Р.Міхайлаў* (літаратура).

**АНІМАЛЬКУЛІ́ЗМ** (ад лац. animalculum звярок, мікраскапічная жывёла), сістэма поглядаў біёлагаў 17—18 ст. (А.Левенгук і інш.), якія лічылі, што ў муж. палавых клетках у мікраскапічным выглядзе знаходзіцца цалкам сфарміраваны дарослы арганізм, а яго развіццё зводзіцца толькі да павелічэння ў памерах. Паслядоўнікі А. ў адрозненне ад авістаў (гл. *Авізм*) лічылі яйцо крыніцай пажыўных рэчываў для сперматазоідаў. А. — адно з цячэнняў у вучэнні аб прэфармацыі (гл. *Прэфармізм*).

**АНІМАТЫ́ЗМ** (ад лац. animatus адушаўлёны), вера ў безасабовую адушаўлёнасць прыроды або асобных яе частак і з'яў; характэрная рыса першабытных рэлігій. А. адрозніваюць ад *гілазаізму* і *анімізму*, ад веры ў асабовых нематэрыяльных істот (духаў).

**АНІМАЦЫ́ЙНАЕ КІ́НО** (ад лац. animatus адушаўлёны, жывы), мультыплікацыя, від кінамастацтва, творы якога ствараюцца спосабам пакадравага малявання або інш. тэхнічнымі спосабамі.

Заснавана на пакадравай здымцы паслядоўных фазаў руху маляваных ці аб'ёмных персанажаў, пластычных кампазіцый. Праекцыя гэтых выяў на экран «ажыўляе» іх. Заснавальнік мультыплікацыі — франц. мастак і інжынер Э.Рэйно, які вынайшаў праксіназскоп (1877), з дапамогай якога з 1892 даваў сеансы маляванага кіно («Аптычны тэатр»). У залежнасці ад тэхнікі стварэння сучаснае А.к. падзяляецца на маляванае (найб. вядомыя майстры У.*Дысней*, І.*Іваноў-Вано*, В.*Кацёначкін*, Р.Качанаў, Ю.*Нарштэйн*, Б.*Сцяпанаў*, Ф.*Хітрук*, А.*Хржаноўскі*); аб'ёмнае («лялечнае»; заснавальнік У.*Старэвіч*, І.*Трнка*, А.*Птушко*); зробленае з дапамогай ігольчастага экрана (відовішча стварае рух тысяч металічных стрыжанькоў; вынаходнік — франц. гравёр А.Аляксееў); ценявое (заснавана на прынцыпе тэатра ценяў; вынаходніца ням. рэж. Л.Райнігер); бяскамернае (малюнак наносяць адразу на плёнку; першы ў гэтай тэхніцы зрабіў фільм канадскі рэж. Н.Мак-Ларэн); камп'ютэрнае.

Бел. А.к. першыя спробы зрабіла ў 1920-я г., выкарыстаўшы выяўл. традыцыі плакатаў і паліт. карыкатур. Мультыплікацыйныя навук.-папулярныя фільмы «Жывыя дамы», «Бунт зубоў» (1928), «Спажывецкая кааперацыя БССР» (1930) былі першай экраннай рэкламай. У 1970—80-я г. ў ценявой тэхніцы зняты фільмы «Прытча пра зямлю», «Прытча пра паветра» і «Прытча пра ваду» (рэж. усіх І.Пікман), у стылі рухомага жывапісу або пластычнай музыкі — «Капрычыо», «Канчэрта Гроса» (І.Воўчак) і «Лафертаўская макоўніца» (А.Марчанка), традыцыі Дыснея прадоўжаны ў фільме «Марафон» (М.Тумеля), для дзяцей і дарослых зроблены маляваныя і лялечныя фільмы «Песня пра зубра» (А.Белавусаў), «Дудка-весялушка», «Несцерка» (Я.Ларчанка), «Ліса, Мужык і Мядзведзь», «Асцярожна, карасі!», «Гліняная Адоска», «Як Васіль гаспадарыў» (усе В.Доўнар), у якіх адлюстраваны бел. фальклор, «Светлячок і Расінка», «Мілавіца» (рэж. Ю.Батурын) на тэмы лірыкі М.Танка і У.Дубоўкі, «Цімка і Дзімка» (М.Лубянікава), «Хлопчык і птушка» (У.Піменаў), «Пра ката Васю і паляўнічую катавасію», «Пустэльнік і ружа», «Ліс-тападнічак», «Пінчэр Боб і сем званочкаў» (усе К.Красніцкі), «Не шамацець!», «Фантазіі Сідарава» (Т.Жыткоўская) і інш. *В.Ф.Нячай.*

Да арт. Анімалістычны жанр. П.Потэр. Каровы на пашы. 1655.

**АНІМЕ́ЛЕ** Мікалай, бел. этнограф і археолаг сярэдзіны 19 ст. Вольнаадпушчаны селянін Віцебскай губ. Даследаваў матэрыяльную і духоўную культуру паўн.-ўсх. Беларусі. На падставе яго апісанняў Рускае геагр. т-ва выдала працу «Побыт беларускіх сялян» (Этнографический сборник. Спб., 1854. Вып. 2). У ёй апісаны жыллё, хатняе начынне, адзенне, ежа,сямейныя і каляндарныя абрады, вытв. заняткі, звычаі, сац. і маёмасная дыферэнцыяцыя сялянства напярэдадні адмены прыгоннага права. У працы змешчаны таксама нар. прыказкі, песні, паданні. Аўтар высока ацаніў працавітасць, маральныя і інтэлектуальныя якасці беларусаў.

**АНІМІ́ЗМ** [ад лац. anima (animus) дух, душа], вера ў існаванне духаў і душ, у іх уплыў на жыццё людзей і жывёл, на прадметы і з'явы навакольнага свету. Узнік у першабытным грамадстве і лёг у аснову пазнейшых рэлігій. Вераванняў; састаўны элемент кожнай сучаснай рэлігіі. Тэрмінам «А.» абазначаюць і тэорыю ўзнікнення рэлігіі, распрацаваную англ. антраполагам Э.Тайларам (1832—1917), якая зводзіць рэлігію да індывід. псіхалогіі чалавека, не ўлічвае сац. перадумоў яе паходжання.

**АНІ́С** (Aunis), гістарычная вобласць на З Францыі, каля ўзбярэжжа Атланты-

чнага ак. Тэрыторыю займае ч. дэпартаментаў Прыморская Шаранта і Дзе-Сеўр. Пл. 2,9 тыс. км². Нас. 315 тыс. чал. (1982). Гал. горад — Ла-Рашэль.

**АНІ́С** (Pimpinella anisum), бядрынец анісавы, аднагадовая травяністая расліна сям. сельдэрэевых. Радзіма — М. Азія. Культывуецца ў Еўропе, Азіі, Паўн. Афрыцы і Амерыцы. На Беларусі малапашыраная культура, вырошчваецца ў адкрытым грунце і цяпліцах.

Сцябло прамое, галінастае, выш. 25—50 см. Прыкаранёвае лісце круглавата-сэрцападобнае, з зубчастым краем, на доўгіх чаранках, сцябловае — складанаперыстарассечанае. Кветкі дробныя, белыя, у складаных парасоніках. Плод — шэра-зялёная двухсямянка. Святло-, цяпло- і вільгацелюбівая расліна, патрабавальная да ўрадлівасці глебы. Размнажаюць насеннем. Плады маюць да 6% эфірнага і да 28% тлустага алею. Вострапрыпраўная расліна. Выкарыстоўваецца ў хлебапякарнай, кандытарскай, лікёрагарэлачнай, парфумернай прам-сці, у медыцыне. Добры меданос.

**АНІ́С ЗО́РЧАТЫ**, гл. *Бадзян.*

**АНІ́С ПАЛАСА́ТЫ**, аніс шэры, аніс зялёны, старадаўні паволжскі сорт яблыні нар. селекцыі. Пашыраны ў Паволжы і сярэдняй паласе ўсх. ч. Еўропы. На Беларусі вырошчваюць пераважна ў Магілёўскай, часткова ў Гомельскай, Мінскай і Віцебскай абл., таксама трапляюцца інш. сарты анісу — пунсовы, ружавата-паласаты (Магілёўская вобл.) і аксамітавы (Віцебская вобл.), якія адрозніваюцца памерамі, афарбоўкай і часам выспявання пладоў.

Дрэвы выш. 5—8 м, даўгавечныя (жывуць да 100—120 гадоў). Плады масай каля 70 г, сярэдняга памеру, плоскай або плоска-акруглай формы, сакавітыя, з кісла-салодкім смакам і характэрным «анісавым» пахам, суцэльнай ярка-кармінавай афарбоўкі або паласатай па светла-зялёна-жоўтым фоне. Мякаць зеленавата-белая, дробназярністая. Непатрабавальны да глебы, мароза- і засухаўстойлівы, высокаўраджайны сорт (на Беларусі сярэдні ўраджай 160 кг з дрэва). Пладаносіць ва ўзросце 6—8 гадоў. Плады збіраюць у канцы верасня (захоўваюцца да лютага, сакавіка і пазней). Спажываюць свежыя і мочаныя, таксама сушаць, кансервуюць, робяць з іх віно, вараць варэнне. Пашкоджваюцца пладовай гніллю і паршою.

**АНІ́САЎ** Сяргей Рыгоравіч (парт. псеўд. Пеця, Казлоўскі Мікалай; 19.10.1906, в. Тур'я Краснапольскага р-на Магілёўскай вобл. — 7.3.1987), дзеяч рэв. руху ў Зах. Беларусі, публіцыст. У 1927—32 на камсамольскай рабоце ў БССР. З 1932 на падп. рабоце ў Зах. Беларусі, з 1934 1-ы сакратар ЦК КСМЗБ, з 1935 сакратар Брэсцкага акр. к-та КПЗБ. У кастр. 1935 зняволены, з 1939 у ням. лагеры ваеннапалонных. Пасля Вял. Айч. вайны працаваў у друку. Аўтар прац «З гісторыі камсамольскага падполля Заходняй Беларусі» (1958), «За волю і шчасце народа» (1959), «Палымянае юнацтва» (1969), «У змаганні гартаваліся» (1975).

**АНІСЁНКА** Валерый Данілавіч (н. 5.6.1944, г. Талачын), бел. акцёр, рэжысёр. Засл. дз. маст. Беларусі (1991). Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1965), Вышэйшыя рэжысёрскія тэатр. курсы пры Ін-це тэатр. мастацтва ў Маскве (1978). У 1965—67 у Бел. т-ры імя Я.Коласа, у 1969—77 у т-ры Я.Купалы. У 1960—70-я г. займаўся канцэртнай дзейнасцю як чытальнік. З 1979 гал. рэжысёр Бел. рэсп. т-ра юнага гледача, Тэатра-студыі кінаакцёра, Бел. радыё. Дзярж. прэмія Беларусі 1990.

**АНІСІМАЎ** Аляксандр Міхайлавіч (н. 8.10.1947, Масква), дырыжор. Засл. дз. маст. Расіі (1988). Скончыў Ленінградскую (1975) і Маскоўскую (1980) кансерваторыі. Дырыжор Ленінградскага Малога (1975—80) і Пермскага (1984—89) т-раў оперы і балета. У 1980—84 і з 1989 гал. дырыжор Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі. Пад яго муз. кіраўніцтвам паст. нац. балет «Курган» Я.Глебава (1982), оперы «Новая зямля» Ю.Семянякі (1982) і «Дзікае паляванне караля Стаха» У.Солтана (1989, Дзярж. прэмія Беларусі 1990). Сярод інш. работ на бел. сцэне: «Рыгалета» Дж.Вердзі (1981), «Шчаўкунок» (1982) і «Іаланта» (1993) П.Чайкоўскага, «Іван Сусанін» М.Глінкі (1984), «Кармэн» Ж.Бізэ (1990), «Карсар» А.Адана (1991), «Лэдзі Макбет Мцэнскага павета» Дз.Шастаковіча (1994).

*Н.В.Кузняцова.*

Аніс звычайны.

**АНІСІМАЎ** Іван, збройнік 17 ст., майстар шабельнай справы. Родам з Глыбокага (Віцебская вобл.). Разам з інш. бел. майстрамі працаваў у Аружэйнай палаце Маскоўскага Крамля. У 1662—65 па загадзе цара вучыўся ў Астрахані «рабіць чаркаскія шаблі». Вярнуўшыся, разам з 7 «таварышчы» зрабіў «5 ножан шабельных на чаркаскае дзела з меднаю аправаю мінулага».

**АНІСІМАЎ** Насонка, разьбяр па дрэве 17 ст. Родам з Беларусі. Працаваў у Майстарскай палаце Маскоўскага Крамля. У 1648 разам з інш. бел. майстрамі «рабіў палаці і ставіў іканастасы» ў Данской царкве.

Аніс паласаты.

**АНІСІ́ФАР** (прозвішча Пятровіч-Дзевачка; ? — 1592 ці 1594), мітрапаліт кіеўскі, галіцкі і ўсея Русі. Паходзіў з галіцкай шляхты. Пасля 1568 архімандрыт Лаўрышаўскага манастыра (каля Навагрудка). З 1579 мітрапаліт. Жыў пераважна ў Навагрудку. Садзейнічаў выданню ў віленскай друкарні Мамонічаў «Службоўніка» (1583). Дамогся ад польскага караля і вял. кн. ВКЛ Стафана Баторыя пацвярджэння незалежнай юрысдыкцыі правасл. царквы (1585) і дазволу спраўляць царк. святы паводле юліянскага календара (1586). У 1589 пазбаўлены сану за парушэнне кананічнага правіла (быў дваяжонцам). Памёр у Лаўрышаўскім манастыры.

*М.В.Нікалаеў.*

**АНІ́СКАВІЧЫ**, вёска ў Беларусі, у Кобрынскім р-не Брэсцкай вобл. Цэнтр сельсавета. За 33 км на ПдУ ад Кобрына, 85 км ад Брэста, 12 км ад чыг. ст. Антопаль. 272 ж., 95 двароў (1994). Сярэдняя школа, Дом культуры, бібліятэка.

**АНІСКО́ВІЧ** Уладзімір Ігнатавіч (н. 25.10.1932, в. Гасцілавічы Лагойскага р-на Мінскай вобл.), бел. перакладчык, крытык. Скончыў БДУ (1971). Працаваў у Мінскім трамвайна-тралейбусным упраўленні, на радыё, у прэсе, выдавецтвах. Пераклаў з балг. мовы раманы І.Давыдкава «Белы конь за акном» (1981), А.Гуляшкі «Вандроўнік блукае па свеце» (1988), аповесці С.Страціева «Кароткае сонца» (1979), Г.Мішава «Зроблена ў правінцыі» (1981), П.Вежынава «Вышэй за ўсё» і «Бар'ер» (1983), творы для дзяцей Б.Апрылава, І.Мілева, І.Радзічкава, А.Стаянава, Н.Хайтава і інш. Выступае з артыкуламі па пытаннях бел. л-ры, праблемах прозы.

**АНІСО́ВІЧ** Генадзь Анатолевіч (н. 25.8.1932, Мінск), бел. вучоны ў галіне матэрыялазнаўства. Акад. АН Беларусі (1984, чл.-кар. 1972), д-р тэхн. н. (1970), праф. (1981). Засл. дз. нав. і тэхн. Беларусі (1978). Скончыў БПІ (1955). З 1960 у Фізіка-тэхн. ін-це АН Беларусі, з 1970 дырэктар Магілёўскага аддз. гэтага ін-та, з 1992 — Ін-та тэхналогіі металаў АН Беларусі (Магілёў). Навук. працы па тэхналогіі металаў, цеплафізіцы ліцейных працэсаў, цеплавых асновах тэхналогіі металаў пры фазавых пераўтварэннях. Распрацаваў метады вызначэння тэрмафіз. уласцівасцяў металаў, сплаваў і фармовачных сумесяў, новыя спосабы атрымання адлівак і загатовак з чорных і каляровых сплаваў у спец. відах ліцця (намарожваннем, у какіль і інш.).

*Тв.*: Охлаждение отливки в комбинированной форме. М., 1969 (разам з М.П.Жмакіным); Затвердевание отливок. Мн., 1979.

**АНІ́ЧА** (Onitsha), горад у Нігерыі, адзін з гал. партоў на р. Нігер. 220 тыс. ж. (1975). Трансп. вузел. Буйны гандл. цэнтр (плады алейнай пальмы, маніёку, ямс). Вытворчасць алею. Прадпрыемствы па выт-сці тэкстылю, паперы, шын, аўтазапчастак, харчасмакавай прам-сці.

**А́НІЧКАЎ** Дзмітрый Сяргеевіч (1733—1.5.1788), рускі асветнік, філосаф. Праф. філасофіі і матэматыкі Маскоўскага ун-та (з 1771). Паслядоўнік філасофіі Х.*Вольфа*. У дысертацыі «...Пра пачатак і паходжанне натуральнага багашанавання...» (1769), напісанай з пазіцый дэізму, паходжанне рэлігіі тлумачыў страхам людзей перад незразумелымі сіламі прыроды, неадукаванасцю. За свае погляды зазнаў ганенні царквы і часткі прафесуры. У тэорыі пазнання развіваў ідэі матэрыялістычнага сенсуалізму.

*Тв.*: У кн.: Избранные произведения русских мыслителей второй половины XVIII века. М., 1952. Т. 1. С. 112—184.

**А́НІЧКАЎ** Мікалай Мікалаевіч (3.11.1885, С.-Пецярбург — 7.12.1964), савецкі патамарфолаг. Акад. АН СССР (1939), АМН СССР (1944). Скончыў Ваенна-мед. акадэмію ў Пецярбургу (1909). У 1920—46 праф. гэтай акадэміі, адначасова з 1920 у Ін-це эксперым. медыцыны АМН СССР. У 1946—53 прэзідэнт АМН СССР. Навук. працы па эксперым. паталогіі і патафізіялогіі, якія стварылі аснову сучасных уяўленняў пра атэрасклероз, аўтаінфекцыю, рэтыкула-эндатэліяльную сістэму. Ганаровы чл. АН Румыніі (1948), чл. АН ГДР (1962). Дзярж. прэмія СССР 1942. Прэмія імя І.І.Мечнікава АН СССР 1952.

*Тв.*: Учение о ретикуло-эндотелиальной системе. М.; Л., 1930; Морфология заживления ран. М., 1951 (у сааўт.).

**А́НІЧКІН** Уладзімір Уладзіміравіч (н. 24.9.1949 станцыя Дабрынка Варонежскай вобл.), хірург. Д-р мед. н. (1988), праф. (1989). Скончыў Віцебскі мед. ін-т (1972), працуе ў гэтым ін-це (з 1986 прарэктар). Навук. працы па дыягностыцы, лячэнні і прафілактыцы паслянаперацыйных ускладненняў і органазберагальных аперацыях пры язвавай хваробе дванаццаціперснай кішкі, пластычнай хірургіі. Прапанаваў спосабы пратэзавання трахеі. Ганаровы д-р мед. ф-та Масачусецкага тэхнал. ін-та (1990).

*Тв.*: Изолированная резекция бифуркации трахеи. Мн., 1992 (разам з М.Р.Сачакам і У.П.Харчанкам); Протезирование трахеи. Мн., 1995 (разам з М.Р.Сачакам і А.С.Карпіцкім).

**АНІЧЭ́НКА** Уладзімір Васілевіч (н. 20.7.1924, в. Янаўка Хоцімскага р-на Магілёўскай вобл.), бел. мовазнавец. Д-р філал. н. (1970), праф. (1971). Засл. дз. нав. Беларусі (1976). Скончыў БДУ (1952). У 1955—70 у Ін-це мовазнаўства АН Беларусі, з 1970 у Гомельскім ун-це (у 1970—91 заг. кафедры). Даследуе пытанні бел. і слав. мовазнаўства. Аўтар манаграфіі «Беларуска-ўкраінскія пісьмова-моўныя сувязі» (1969), «Гістарычнай лексікалогіі беларускай мовы» (1970; у сааўт.), вучэбных дапаможнікаў для ВНУ па марфалогіі, гіст. лексікалогіі і фанетыцы ўсх.-слав. моў, «Слоўніка мовы Скарыны» (т. 1—3, 1977—94), кніг «Беларускі казачны эпас» (1976) і «Голас з невычэрпнай і жыватворнай крыніцы» (1995). Дзярж. прэмія Беларусі 1988.

**АНІ́ШЧАНКА** Сяргей Пятровіч (20.4.1923, в. Сцяпы Жлобінскага р-на Гомельскай вобл. — 31.7.1944), Герой Сав. Саюза (1945). У Вял. Айч. вайну падпольшчык, партыз. сувязны, з восені 1943 у Чырв. Арміі. Вызначыўся 24—25.6.1944 пры вызваленні Рагачоўскага р-на Гомельскай вобл.: пераправіўся цераз р. Друць, захапіў плацдарм. Загінуў у баі на тэр. Польшчы.

**АНІШЧУ́К** Аляксандр Рыгоравіч (н. 10.8.1934, г. Томск, Расія), бел. вучоны ў галіне радыётэхнікі. Д-р тэхн. н. (1990), праф. (1991). Скончыў Мінскае вышэйшае інж. радыётэхн. вучылішча (1956), дзе працаваў. З 1989 у Бел. дзярж. ун-це інфарматыкі і радыёэлектронікі. Распрацаваў геам. тэорыю ўзгаднення, на падставе якой вырашаны шэраг задач праектавання радыётэхн. канструкцый і сістэм з аптымальнымі энергет. характарыстыкамі ў рознай паласе частот.

*Тв.*: Радиоприемные устройства РЭС. Мн., 1984 (разам з Р.П.Чугуновым); Радиоприемные устройства радиоэлектронной техники. М., 1992 (у сааўт.).

**АНІ́ШЧЫК** Аркадзь Аркадзевіч (н. 25.4.1945, г. Навагрудак), бел. мастак дэкар.-прыкладнога мастацтва. Скончыў Пражскую вышэйшую школу прыкладнога мастацтва (1975). У 1975—90 мастак шклозавода «Нёман». Яго работы адметныя выразнасцю вобраза, прапорцый, высокай ступенню абагульнення (камплект пітнога посуду, крышталь, гладзь, 1976). З 1990 жыве ў Фінляндыі.

**АНІ́ШЧЫК** Віктар Міхайлавіч (н. 19.3.1945, г.п. Наваельня Дзятлаўскага р-на Гродзенскай вобл.), бел. фізік. Д-р фізіка-матэм. н. (1990), праф. (1991). Скончыў БДУ (1967). З 1970 у БДУ. Навук. працы па фізіцы цвёрдага цела, радыяцыйным матэрыялазнаўстве, электроннай структуры крышталёў. Распрацаваў методыкі і тэхнал. працэсы мадыфікацыі ўласцівасцяў металаў і сплаваў іоннымі пучкамі.

*Тв.*: Структурный анализ. Мн., 1979 (разам з Г.А.Гуманскім).

**АНІ́ШЧЫК** Міхаіл Трафімавіч (16.10.1905, в. Була Івацэвіцкага р-на Брэсцкай вобл. — 8.2.1973), дзеяч нац.-вызв. і рэв. руху ў Зах. Беларусі. З 1926 у Бел. сялянска-работніцкай грамадзе. З 1929 сакратар Слонімскага акр. к-та КСМЗБ, з 1934 — КПЗБ. Тройчы зняволены польск. ўладамі. З 1939 старшыня Слонімскага гарвыканкома. У Вял. Айч. вайну ў Чырв. Арміі, з 1943 у тыле ворага, пам. упаўнаважанага ЦК КП(б)Б і БШПР па Баранавіцкай вобл., сакратар Слонімскага падп. РК КП(б)Б, рэдактар падп. газеты «Вольная праца». Пасля вайны на парт. і сав. рабоце. Дэп. ВС БССР у 1955—63.

**АНІЯНІ́ТЫ**, гл. ў арт. *Іаніты*.

**АНКАЛО́ГІІ І МЕДЫЦЫ́НСКАЙ РАДЫЯЛО́ГІІ НДІ** Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь. Засн. ў 1960 у Мінску на базе Рэсп. анкалагічнага дыспансера (з 1934) і анкалагічных аддзяленняў 1-й клінічнай бальніцы Мінска. З 1965 у пас. Лясны Мінскага р-на. Галаўны навук., лячэбна-кансультацыйны і арганізац.-ме-

тадычны цэнтр па праблемах анкалогіі і мед. радыялогіі. Асн. кірункі даследаванняў: эпідэміял. і лабараторны кантроль злаякасных новаўтварэнняў, распрацоўка і ўдасканаленне метадаў дыягностыкі і лячэння рака з выкарыстаннем хіміятармонатэрапіі, прамянёвай тэрапіі, мадыфікавальных уздзеянняў; мед. рэабілітацыя анкалагічных хворых. Аспірантура з 1962. Выдае зб. «Актуальныя праблемы анкалогіі і медыцынскай радыялогіі».

**АНКАЛО́ГІЯ** (ад грэч. onkos пухліна + *...логія*), галіна медыцыны, якая вывучае прычыны ўзнікнення, механізм развіцця і клінічныя праяўленні новаўтварэнняў, распрацоўвае метады іх дыягностыкі, лячэння і прафілактыкі.

Найб. ранняе ўпамінанне пра пухліны знаходзяць у егіпецкіх папірусах (3—2,5 тыс. гадоў да н.э.), у працах Гіпакрата, Галена. Як асобная галіна медыцыны А. пачала фарміравацца ў 19 ст. (рус. вучоныя М.А.Навінскі, М.М.Руднеў, ням. Р.Вірхаў, П.Эрліх і інш.). Хуткае развіццё А. ў Расіі звязана з заснаваннем у пач. 20 ст. анкалагічнай школы (М.М.Пятроў, П.А.Герцэн і інш.). У А. склаліся 3 асн. кірункі: вірусны (франц. вучоны А.Барэль, 1903), хім. (яп. вучоныя К.Ямагіва і К.Ітыкава, 1915) і радыяцыйны (франц. вучоны А.Лакасань, 1932). У 1960-я г. Л.А.Зільбер прапанаваў вірусна-генет. тэорыю пухлін.

На Беларусі анкалагічныя даследаванні пачалі развівацца ў 1920-я г., інтэнсіўна — пасля стварэння НДІ анкалогіі і мед. радыялогіі ў 1960 пад кіраўніцтвам М.М.Аляксандрава. Распрацаваны метады камбінаванага і комплекснага лячэння злаякасных пухлін з выкарыстаннем вадкіх радыеактыўных ізатопаў (Аляксандраў, Л.С.Сукаватых), гарманальных уздзеянняў (Ц.А.Панцюшэнка), гіпертэрміі (С.З.Фрадкін), прамянёвай тэрапіі (І.Р.Жакаў, Г.У.Мураўская), хіміятэрапіі (Э.А.Жаўрыд). Праводзяцца даследаванні па лячэнні пухлін шчытападобнай залозы (Я.П.Дзямідчык), арганізацыі анкалагічнай дапамогі насельніцтву (Я.А.Караткевіч), лабараторнай дыягностыцы (А.А.Машэўскі), анкагінекалогіі (К.Я.Вішнеўская), анкауралогіі (А.С.Маўрычаў), анкаабдамінальнай хірургіі (У.М.Сукалінскі), анкатаракальнай хірургіі (У.В.Жаркоў), анкапатамарфалогіі і цыталогіі (Г.М.Мураўёў, Л.Б.Клюкіна), пластычнай анкахірургіі (І.В.Залуцкі). Сістэма анкалагічнай дапамогі насельніцтву ўключае НДІ анкалогіі і мед. радыялогіі, кафедры анкалогіі Бел. ін-та ўдасканалення ўрачоў і мед. ін-таў, 12 абл. і гар. (міжраённых) дыспансераў, шырокую сетку анкалагічных кабінетаў. Створана аўтаматызаваная сістэма ўліку інфармацыі пра анкалагічных хворых. Як вынік катастрофы на Чарнобыльскай АЭС (1986) у рэспубліцы адзначаны пастаянны рост захворванняў на злаякасныя пухліны, у 1994 зарэгістравана амаль 30 тыс. новых выпадкаў, выяўлены значны рост рака шчытападобнай залозы сярод дзяцей, што жывуць у забруджаных радыенуклідамі раёнах. На дыспансерным уліку больш за 125 тыс. чалавек, якія атрымалі спец. лячэнне ад рака (1994).

*Літ.:* Клиническая онкология. 2 изд. Т. 1—2. М., 1979; Шабад Л.М. Эволюция концепций бластомогенеза. М., 1979; Актуальные проблемы онкологии и медицинской радиологии. Мн., 1993. С. 3—9.

*Ц.А.Панцюшэнка.*

**АНКАРА́** (Ankara), Ангора, горад, сталіца *Турцыі* і адм. ц. аднайменнага іл. 2,56 млн. ж. (з прыгарадамі каля 3,2 млн.; 1990). На выш. 848 м у катлавіне Анаталійскага пласкагор'я ў месцы зліцця рэк Чубук і Анкара. Адзін з важнейшых прамысл. і гандл. цэнтраў краіны. Блізкасць А. да металург. базы (з-д у г. Карабюк), каменнавугальнага бас. Зангулдак і крыніц с.-г. сыравіны спрыяе развіццю разнастайнай прам-сці: металаапр., маш.-буд. (авіяц., электратэхн., трактаразборачны і інш. з-ды), хім., цэментнай, шыннай, харчасмакавай, паліграфічнай. Рамесная вытв-сць — вырабы з воўны ан-

Анкара.

Да арт. Анкер. Анкерны ход гадзінніка: 1 — імпульсны камень; 2 — падвойны ролік; 3 — анкер, ці анкерная вілка; 4 — палеты, ці штыфты, анкера; 5 — анкернае кола.

Анкерыт.

горскіх коз (тыфтык), ткацтва дываноў і інш. Чыгункі і аўтатрасы звязваюць А. з асн. прамысл. цэнтрамі і партамі краіны, праз міжнар. аэрапорт — з многімі краінамі свету.

Засн. ў 7 ст. да н.э. фрыгійскім царом Мідасам. Уваходзіла ў Рымскую імперыю, Візантыю, з 14 ст. ў Асманскую імперыю. У стараж. і сярэднія вякі — важны цэнтр каравааннага гандлю ў Анатоліі. Каля горада адбылася *Анкарская бітва 1402*. А. — цэнтр нац.-вызв. руху 1918—22, рэзідэнцыя Прадстаўнічага к-та, з 23.4.1920 — Вял. нац. сходу Турцыі і створанага ім урада. З 1923 сталіца Турцыі.

У Старым горадзе з вузкімі вулачкамі — храм Аўгуста і Ромы (засн. ў 2 ст. да н.э.), тэрмы (канец 2 ст. — пач. 3 ст.), калона Юліяна (4 ст.), сцены цытадэлі (эпоха Аўгуста), мячэці Алааддзіна (1178), Арслан-хана (1210, перабудавана ў 1330), крыты рынак Махмудпашы (паміж 1464 і 1471). У Новым горадзе (развіваецца з 1920) рэгулярная планіроўка, шматпавярховыя дамы, катэджы, комплекс мін-ваў і новага меджліса, маўзалей Ататюрка (1953, арх. Э.Анат, А.Арда, скульпт. З.Мюрыдаглу і інш.). Помнік Ататюрку (1971, скульпт. Х.Гезер). 3 ун-ты, кансерваторыя, 6 дзярж. тэатраў. Археал. і Этнагр. музеі.

*Ф.С.Фешчанка* (гаспадарка).

**АНКА́РСКАЯ БІ́ТВА 1402**, адбылася паміж войскамі сярэдневяковага эміра *Цімура* і тур. султана *Баязіда* I пад Анкарой 28 (або 20) ліпеня. Цімуру ўдалося зайсці ў тыл тур. войскам, якія займалі абарону ў гарах, і акружыць Анкару. Атакі ўдвая меншага тур. войска, якое падышло да горада, былі адбіты. Пераход на бок Цімура анаталійскіх беяў паскорыў паражэнне Баязіда. Зыход бітвы прывёў да часовага распаду Турцыі.

**А́НКАРЫДЖ** (Anchorage), горад у ЗША, на Пд штата Аляска. Засн. ў 1914. 226 тыс. ж. (1990). Найбольшы гандл.-фінансавы цэнтр штата. Порт на беразе заліва Аляска Ціхага ак. Міжнар. аэрапорт; чыг. станцыя на лініі Фэрбанкс — Сьюард. Лясная, дрэваапр., харч. (перапрацоўка рыбы), паліграф. прам-сць, вытв-сць буд. матэрыялаў. 2 ун-ты. У 1964 быў моцна разбураны землетрасеннем.

**А́НКЕР** (ням. Anker літар. якар), 1) дэталь гадзіннікавага механізма (вагальная вілка) — прамежкавае звяно паміж маятнікам ці *балансірам* (у залежнасці ад тыпу гадзінніка) і спускавым колам. Забяспечвае раўнамерны ход гадзіннікавага механізма. 2) Дэталь для змацавання частак збудаванняў або машын (напр., анкерная пліта, анкерны болт і інш.).

**АНКЕРЫ́Т** (ад прозвішча аўстр. мінералога М.Анкера), мінерал класа карбанатаў групы даламітаў $Ca(Mg,Fe)[CO_3]_2$. Крышталізуецца ў трыганальнай сінганіі. Крышталі ромбаэдрычныя, агрэгаты зярністыя і шчыльныя. Колер белы, жаўтаваты, буры, ружовы, шэры і блакітны. Бляск шкляны. Цв. 3,5—4.

Шчыльн. 3 г/см$^3$. Тыповы мінерал у гідратэрмальных жылах поліметалічных радовішчаў, у жылах, звязаных з жал. рудамі, у асадкавых тоўшчах і інш. На Беларусі ёсць у адкладах валдайскай серыі дакембрыю.

**АНКЕ́ТА** (франц. enquête літар. расследаванне), апытальны ліст для атрымання якіх-н. звестак пра таго, хто яго запаўняе, або адказаў на пытанні, складзеныя па пэўнай праграме (напр., у сацыялагічных апытаннях).

**АНКЕТАВА́ННЕ**, метад збору пачатковага матэрыялу для сацыялагічных, эканамічных, псіхалагічных і інш. даследаванняў. Праводзіцца ананімна, у пісьмовай форме з выкарыстаннем апытальных лістоў (анкет), у прысутнасці даследчыка і без яго (па пошце). Пытанні А. павінны быць аб'яднаны агульнай тэмай даследавання, сфармуляваны дакладна, адназначна, на даступнай рэспандэнтам мове. Адрозніваюць пытанні адкрытыя (свабода ў выбары адказу) і закрытыя (адказ выбіраецца з прапанаваных варыянтаў), аб'ектыўныя (пра ўзрост, адукацыю і інш.) і суб'ектыўныя (высвятляюць сац.-псіхал. ўстаноўкі або меркаванні рэспандэнтаў). Гл. таксама *Апытанне*. *С.А.Яцкевіч.*

**АНКІЛАЗА́ЎРЫ**, (Ankylosauria), панцырныя дыназаўры, падатрад выкапнёвых паўзуноў атр. птушкатазавых дыназаўраў. Рэшткі вядомы з адкладаў сярэдняй і верхняй юры Зах. Еўропы і мелу Паўн. Амерыкі, Зах. Еўропы і Аўстраліі. 2 сям., каля 25 родаў, 40 відаў.

Даўж. да 9 м. Мелі шырокае, сплюшчанае цела, зверху ўкрытае касцянымі шыпамі і панцырнымі пласцінкамі, зліты мі ў суцэльны панцыр (адсюль другая назва). На канцы хваста, які служыў актыўным сродкам абароны ад драпежных дыназаўраў, былі вострыя шыпы. Карміліся расліннасцю.

**АНКІЛАСТАМО́З**, гельмінтозная хвароба чалавека і жывёл, пры якой пашкоджваецца тонкі кішэчнік. Узбуджальнік — нематоды з роду анкіластом (Ancylostoma). Сустракаецца пераважна ў раёнах з цёплым і вільготным кліматам, на Беларусі адзначаецца ўсюды. Прыкметы: ірвота, паносы з прымешкамі крыві ў фекаліях, схуднение. Яйцы паразіта з калам інвазіраваных чалавека і жывёл трапляюць у вонкавае асяроддзе, з іх развіваюцца рухомыя лічынкі, якія праз рот ці скуру пранікаюць у арганізм гаспадара і ператвараюцца ў кішэчніку ў палаваспелых анкіластом. Лячэнне тэрапеўтычнае.

**АНКІЛО́З** (ад грэч. ankylos крывы, сагнуты), поўная нерухомасць сустава пры паталагічных зменах яго тканак. Адрозніваюць А. касцявыя (касцявое зрастанне сустаўных паверхняў паміж сабой), пазасустаўныя (утварэнне касцявой перамычкі за кошт акасцянення мяккіх тканак вакол сустава; сустаўная шчыліна пры гэтым захавана), фіброзныя (утварэнне рубцовых спаек паміж сустаўнымі паверхнямі). Пры касцявым і пазасустаўным А. вобласць нерухомага сустава пры функцыян. нагрузцы (хадзе) бязбольная, пры фіброзным — узмоцненая нагрузка выклікае боль у суставе. Развіваецца ад раненняў, закрытых пераломаў касцей у суставе, ад запалення (туберкулёз, ганарэя і інш.), працяглай нерухомасці сустава. Лячэнне хірург. і фізіятэрапеўтычнае.

**АНКІНО́ВІЧ** Лявон Нічыпаравіч (1907, в. Кашына Аршанскага р-на Віцебскай вобл. — 27.9.1943), адзін з кіраўнікоў падполля і партыз. руху ў Віцебскай вобл. ў Вял. Айч. вайну. З 1926 на сав. і адм. рабоце. З 1941 чл., потым кіраўнік Аршанскага парт. цэнтра, у 1942—43 камісар партыз. атрада, 2-і сакратар Аршанскага падп. РК КП(б)Б. Загінуў пры выкананні баявога задання.

Да арт. Анкілазаўры. Стэгазаўр.

**АНКЛА́Ў**, энклаў (франц. enclave ад лац. inclavare замыкаць на ключ), частка тэр. адной дзяржавы, з усіх бакоў акружаная тэр. іншай дзяржавы (напр., Сан-Марына на тэр. Італіі). Калі А. мае выхад да мора, яго наз. паўанклавам (напр., правінцыя Кабінда ў Анголе).

**АНКО́ЛЬ**, від кароткатэрміновага *крэдыту*, які выдаецца банкам на няпэўны тэрмін з прадастаўленнем пазычальніку права выкарыстоўваць гэты крэдыт паступова. Выдаецца па першым патрабаванні крэдытора. Выкарыстоўваецца банкамі для падтрымання неабходнага ўзроўню іх ліквіднасці. А., як правіла, забяспечваецца залогам тавараў, вэксаляў і каштоўных папер. Ад звычайнай пазыкі адрозніваецца тым, што сума доўгу і сума забеспячэння маюць бягучы характар і па патрабаванні кожнага з бакоў у любы момант можа быць спынены. Пазычальнік плаціць банку працэнты толькі за фактычна ўзятыя сумы. У знешнім гандлі А. прадугледжвае пастаўку тавару з фіксацыяй цаны, якая вызначаецца на аснове каціроўкі адпаведнай біржы ў выбраныя пакупніком дні. *Г.І.Краўцова.*

**АНКО́НА** (Ancona), горад і порт на У Цэнтр. Італіі, на Адрыятычным моры. Адм. ц. правінцыі Анкона і вобласці Марке. 104 тыс. ж. (1990). Машынабудаванне (у т.л. суднабудаванне), нафтаперапр., лёгкая, харч. прам-сць; вытв-сць муз. інструментаў, маёлікі, вырабаў са шкла. Рыбалоўства. Ун-т. Нац. музей вобласці Марке, карцінная галерэя. Помнікі ант. і сярэдневяковай архітэктуры: трыумфальная арка Траяна (пасля 115), раманскія і гатычная пабудовы 12—15 ст. Бальнеалагічны курорт. Ваенна-марская база.

**АНО́Д** (ад грэч. anodos узыходжанне), 1) дадатны полюс (клема) крыніцы эл. току (гальванічнага элемента, акумулятара, эл. машыны). Ад А. ў знешнім эл. ланцугу накіраваны эл. ток. 2) Дадатны электрод электравакуумных і іонных прылад, звычайна выраблены з тугаплаўкіх металаў (тантал, малібдэн, чэрнены нікель), калі ахаладжэнне прымусовае — з медзі; іонных прылад — з матэрыялаў з малой другаснай эмісіяй (графіт, жалеза). 3) Дадатны полюс *электрычнай дугі*, электралітычнай ванны (гл. ў арт. *Электраліз*).

**АНО́Н**, рака ў Манголіі і Чыцінскай вобл. Расійскай Федэрацыі. Пры зліцці з р. Інгада ўтварае р. Шылка. Даўж. 1032 км, пл. бас. 96,2 тыс. км$^2$. Пачынаецца на нагор'і Хэнтэй, цячэ пераважна па ўзвышаных стэпавых раўнінах. Жыўленне ў асн. снегавое. Частыя летнія паводкі. Ледастаў з ліст., на перакатах перамярзае. Крыгалом у канцы крас. — пач. мая. Сярэдні расход вады ў ніжнім цячэнні 191 м$^3$/с. Выкарыстоўваецца для арашэння і прамысл. водазабеспячэння.

**АНО́НС** (франц. annonce), папярэдняя аб'ява пра будучыя аўкцыёны, выстаўкі-продажы, спектаклі, радыё- і тэлеперадачы і інш.

**АНО́ПАЛЬ**, вёска ў Беларусі, у Крупіцкім с/с Мінскага р-на. За 25 км на Пд ад Мінска, 17 км ад чыг. ст. Міханавічы. 498 ж., 162 двары (1995). Цэнтр эксперым. базы «Анопаль». Б-ка, клуб. Помнік сядзібна-паркавай архітэктуры 18—19 ст.

**АНО́САЎ** Павел Пятровіч (1799, С.-Пецярбург — 25.5.1851), рускі металург. Скончыў Горны кадэцкі корпус (1817). Працаваў на златаустаўскіх і алтайскіх з-дах. Раскрыў страчаны ў сярэднія вякі сакрэт вырабу булатнай сталі (1837). Распрацаваў новыя спосабы атрымання высакаякаснай сталі праз навугляроджванне жалеза ў тыглі. Даследаваў уплыў легіравальных элементаў на ўласцівасці сталі. Адкрыў метады мікраналізу структуры металаў з дапамогай мікраскопа.

*Тв.*: Собл. соч. М., 1954.

*Літ.*: Прокошкин Д.А. П.П.Аносов, 1799—1851. М., 1971.

**АНО́ФЕЛЕС**, гл. *Малярыйныя камары.*

**АНО́ХІН** Пётр Кузьміч (26.1.1898, Валгаград — 6.3.1974), рускі сав. фізіёлаг. Акад. АН СССР (1966), акад. АМН

СССР (1945). Ганаровы чл. Венгерскай АН (1973). Скончыў Ленінградскі ін-т мед. ведаў (1926). У 1921—30 працаваў у У.М.Бехцерава і І.П.Паўлава (Ленінград), пазней у біял. і мед. установах АМН СССР, з 1950 у Ін-це нармальнай і паталаг. фізіялогіі АМН СССР і інш. Адзін з заснавальнікаў нейракібернетыкі. Навук. працы па нейрафізіял. механізмах вышэйшай нерв. дзейнасці. Ленінская прэмія 1972. Залаты медаль імя І.П.Паўлава АН СССР 1968.

*Тв.*: Кибернетика и интегративная деятельность мозга // Вопр. психологии. 1966. № 3; Биология и нейрофизиология условного рефлекса. М., 1968.

*Літ.*: Квасов Д.Г., Федорова-Грот А.К. Физиологическая школа И.П.Павлова. Л., 1967.

**АНО́ХІНА** Таццяна Аляксандраўна (н. 25.4.1947, С.-Пецярбург), бел. генетык-селекцыянер. Д-р с.-г. н. (1990). Скончыла Ленінградскі с.-г. ін-т (1970). З 1973 у Бел. НДІ земляробства і кармоў. Навук. працы па генетыцы, селекцыі, насенняводстве і тэхналогіі вырошчвання грэчкі. Аўтар асн. раянаваных на Беларусі сартоў грэчкі: Чарнаплодная, Аніта, Беларуская, Жалейка, Жняярка, Зарэчная, Ілія і інш.

**АНО́ШКА** Валерый Станіслававіч (н. 9.8.1938, в. Гайдукова Слабада Чэрвеньскага р-на Мінскай вобл.), бел. вучоны ў галіне фіз. геаграфіі. Д-р геагр. н. (1990), праф. (1991). Скончыў БДУ (1963). З 1964 выкладае ў БДУ. Навук. працы па геагр. прагназаванні, меліярацыйна-геагр. раянаванні тэр. Беларусі, маніторынгавых геагр. даследаваннях. Адзін з заснавальнікаў меліярац.-інжынернай геаграфіі. Распрацаваў канцэпцыю і склаў карту тэхнагеннай парушанасці прыродных комплексаў Беларусі. Аўтар падручніка па меліярац. геаграфіі. Прэзідэнт Бел. геагр. т-ва (з 1983).

*Тв.*: Географические основы мелиорации. Мн., 1974; Мелиоративная география Белоруссии. Мн., 1978; Основы географического прогнозирования. Мн., 1985 (разам з В.М.Шырокавым, А.М.Трафімавым); Рациональное природопользование Белорусского Поозерья. Мн., 1993 (у сааўт.). *Г.П.Анціпаў.*

**АНО́ШКА** (Onoszko) Ян (каля 1775, Быхаўскі р-н Магілёўскай вобл. — 1820 або 1827), польскі і бел. паэт. Дакладныя факты біяграфіі не захаваліся. Некаторыя аўтары атаясамліваюць яго з ксяндзом Янам Аношкам, рэктарам Варшаўскай духоўнай семінарыі (1823—31). Пісаў панегірыкі шляхце, сатыр. вершы. Аўтар паэмы «Бібеіда» (распаўсюджвалася ў рукапісах). У сваіх сентыментальных творах услаўляў жыццё ў вясковым зацішшы («Муза з вясковае далі», «Мае думкі», «На дажынкі»), прапаведаваў працавітасць і сумленнасць («Літасць»), высмейваў асобныя заганы («На п'янага ветрагона»). Некаторыя яго вершы маюць рэлігійна-містычнае адценне («Сон», «Да бога»). У 1828 Т.Урублеўская выдала ў Полацку яго «Паэтычныя творы». П.Мядэкша ўключыў вершы А. ў зб. «Вянок з папараці» (Вільня, 1842). Пра А. як «беларускага паэта» пісалі Р.Падбярэскі, рус. бібліёграф Р.Генадзі. На бел. мову творы А. перакладаў У.Дубоўка.

*Тв.*: У кн.: Беларуская літаратура XIX стагоддзя: Хрэстаматыя. Мн., 1988. С. 451—454. *А.В.Мальдзіс.*

**АНО́ШКАЎСКАЕ ВО́ЗЕРА**, у Беларусі, у Лепельскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Эса. За 21 км на Пд ад г. Лепель. Пл. 0,24 км². Даўж. 0,7 км, найб. шыр. 0,5 км. Пл. вадазбору 6 км². Схілы выш. 3—5 м, разараныя, на ПдЗ параслі хваёвым лесам, на ПнУ — хмызняком. Берагі забалочаныя. Востраў пл. 0,3 га. Зарастае. Выцякае ручай у р. Эса.

**АНО́ШКІ**, вёска ў Беларусі, у Казлоўскім с/с Нясвіжскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр акц. т-ва «Новае жыццё». За 15 км на ПдЗ ад Нясвіжа, 140 км ад Мінска, 11 км ад чыг. ст. Пагарэльцы, 2 км ад шашы Нясвіж—Баранавічы. 968 ж., 330 двароў (1995). Сярэдняя і музычная школы, б-ка, Дом культуры, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі.

**АНО́ШКІН** Іван Архіпавіч (н. 21.1.1928, в. Антонаўка Чавускага р-на Магілёўскай вобл.), бел. пісьменнік. Скончыў Магілёўскі пед. ін-т (1964). Настаўнічаў, працаваў у друку. З 1981 сакратар Магілёўскага абл. аддзялення СП Беларусі. Аўтар кн. апавяданняў і гумарэсак «Лішні мінус» (1959), «Брантазаўр» (1973), «Херувім з чорнымі крыламі» (1984), «Курам не да смеху» (1985), зб. аповесцяў і апавяданняў «Землякі» (1978). Кн. для дзяцей: «Навічок» (1966), «Алёнчын сакрэт» (1969), «Антонаў ясень» (1981) і інш. Аповесць «Чырвоная каліна стаяла...» (1985) пра барацьбу зах.-бел. сялян супраць сац. і нац. прыгнёту.

**АНО́Э**, акцёрская дынастыя японскага т-ра *кабукі*.

Найб. вядомыя: А.Кікугора 1-ы (1717—83), заснавальнік дынастыі, выканаўца роляў юнакоў, жаночых і мужчынскіх; А.Кікугора 5-ы (4.6.1844 — 18.2.1903), выступаў у гіст. і быт. п'есах класічнага рэпертуару кабукі, а таксама ў новых рэалістычных. Зрабіў вял. ўплыў на акцёраў наступнага пакалення; А.Кікугора 6-ы (6.6.1885 — 10.8.1949), выканаўца жаночых і мужчынскіх роляў, заснавальнік і кіраўнік школы акцёраў т-ра кабукі (1931—37). З 1948 чл. яп. Акадэміі мастацтваў; А.Байко 6-ы (15.10.1870 — 8.11.1934), кіраўнік тэатр. трупы з 1911, выконваў жаночыя ролі; А.Байко 7-ы (н. ў 1915, Токіо), адзін з лепшых выканаўцаў жаночых роляў і маладых герояў.

**АНРЫО́** (Hanriot) Франсуа (1761—28.7.1794), дзеяч франц. рэвалюцыі 18 ст., якабінец. Актыўны ўдзельнік паўстання 10.8.1792, якое скінула манархію. З мая 1793 начальнік Парыжскай нац. гвардыі, адзін з кіраўнікоў паўстання 31.5—2.6.1793, што прывяло да ўстанаўлення якабінскай дыктатуры. У час тэрмідарыянскага перавароту (27.7.1794) быў нерашучы ў арганізацыі супраціўлення. Пакараны смерцю тэрмідарыянцамі разам з М.*Рабесп'ерам.*

**А́НСА** (ANSA; Agenzia Nazionale Stampa Associata Нац. агенцтва аб'яднанага друку), італьянскае інфарм. агенцтва. Засн. ў 1945 у Рыме ўладальнікамі італьян. газетных і часопісных выд-ваў. Мае дагаворы на абмен інфармацыяй з найбуйнейшымі сусв. агенцтвамі, шырокую сетку карэспандэнцкіх пунктаў у краіне і за яе межамі.

**АНСА́МБЛЬ** (франц. ensemble літар. разам) у архітэктуры і горадабудаўніцтве, гарманічнае адзінства прасторавай кампазіцыі будынкаў, інж. збудаванняў (масты, набярэжныя і інш.), манум. жывапісу і скульптуры, зялёных насаджэнняў. Ствараецца за невял. адрэзак часу, паводле адзінай задумы і ў адным стылі (*Скарыны праспект* у Мінску, *Гарадніца* ў Гродне і інш.) або за працяглы час дапаўненнем першапач. кампазіцыі. Цэласнасць такога А. дасягаецца толькі пры захаванні агульных прынцыпаў яго пабудовы, арган. спалучэнні новага са старым (А. *Крамля Маскоўскага*, П'яцца Сан-Марка ў Венецыі, *Дварцовая плошча* ў С.-Пецярбургу, *Жыровіцкі Успенскі манастыр*). Для больш глыбокага раскрыцця ідэйна-вобразнай сутнасці А. і эмацыянальнага ўздзеяння на гледача ў яго кампазіцыю часам уключаюць творы розных відаў мастацтва (гл. *Сінтэз мастацтваў*): пл. Дзекабрыстаў у С.-Пецярбургу з помнікам Пятру I, палацава-паркавыя А. 17—18 ст. (*Версаль, Петрадварэц, Гомельскі палацава-паркавы ансамбль* і інш.), плошчы Перамогі ў Мінску і Віцебску. Прынцыпы ансамблевасці забудовы закладваюцца ў генпланах.

У кампазіцыі А. адрозніваюць: глыбінна-прасторавую будову перспектывы (уздоўж выцягнутай плошчы, праспекта, вуліцы, бульвара), замкнёную ці напаўзамкнёную прастору, абмежаваную забудовамі ці зялёнымі насаджэннямі (гар. і паркавыя плошчы, унутрыквартальныя прасторы і інш.), жывапісную (гал. чынам у пейзажных парках і зялёных зонах). Як твор мастацтва А. падпарадкоўваецца агульным прынцыпам пабудовы маст. формы (гарманічныя суадносіны частак і цэлага, вылучэнне гал. элементаў кампазіцыі і інш.). Пры стварэнні А. актыўна выкарыстоўваюць сіметрыю, асіметрыю, маштаб, прапорцыі, кантраст, нюанс і інш. сродкі арх. выразнасці.

*Літ.*: Иконников А.В. Эстетические проблемы архитектуры. М., 1970; Формирование архитектурных ансамблей в современном городе. М., 1974. *Ю.Н.Кішык.*

**АНСА́МБЛЬ**, 1) група музыкантаў-інструменталістаў або спевакоў, аб'яднаных для сумеснага выканання. А. падзяляюцца паводле складу (аднародныя і мяшаныя), колькасці ўдзельнікаў (*дуэт, трыо, квартэт, квінтэт* і інш.); пашыраны эстрадныя вак.-інстр. А., рок-групы. А. наз. таксама і вял. выка-

нальніцкія калектывы, якія ўключаюць групы вакалістаў, інструменталістаў, танцораў (*ансамбль песні і танца, ансамбль танца*). Сярод вядомых бел. А.: *Беларускі вакальны квартэт, Дзяржаўны смыковы квартэт БССР*, вак. квартэт «*Купалінка*», вак.-інстр. А. «*Песняры*», «*Верасы*», «*Сябры*», А. нар. музыкі «Свята» і «Крупіцкія музыкі», А. салістаў «*Класік-Авангард*», А. старадаўняй музыкі «Кантабіле», рок-група «Сузор'е», харэагр. А. «*Харошкі*». Устойлівыя тыпы А. склаліся і ў вясковым муз. побыце розных народаў, у т.л. беларусаў (гл. *Гурт, Народныя інструментальныя ансамблі*). 2) Муз. твор для А. выканаўцаў (дуэт, трыо, квартэт і інш.) ці структурна завершаны фрагмент для групы салістаў у оперы, араторыі, кантаце. 3) Стройнасць, зладжанасць выканання.

4) У тэатральным мастацтве — зладжанае, узгодненае выкананне сцэнічнага твора ўсімі ўдзельнікамі спектакля. Садзейнічае найб. поўнаму раскрыццю маст. сутнасці драм. твора, гарманічнаму спалучэнню ў адзінае цэлае знешніх і ўнутр. кампанентаў тэатр. дзеяння, выяўляе стылявое адзінства спектакля. Выдатнымі ўзорамі А. з'яўляюцца лепшыя спектаклі бел. т-раў імя Я.Купалы («Паўлінка» Я.Купалы, «Трыбунал» А.Макаёнка), імя Я.Коласа («Несцерка» В.Вольскага, «Раскіданае гняздо» Я.Купалы), юнага гледача («Папараць-кветка» І.Козела) і інш.

*І.Дз.Назіна (музыка).*

Да арт. **Ансамбль** у архітэктуры і горадабудаўніцтве. П'яцца Сан-Марка ў Венецыі.

Да арт. **Ансамбль** у архітэктуры і горадабудаўніцтве. Праспект Ф.Скарыны ў Мінску.

**АНСА́МБЛЬ БЕЛАРУ́СКАЙ НАРО́ДНАЙ ПЕ́СНІ І ТА́НЦА БЕЛАРУ́СКАЙ ФІЛАРМО́НІІ.** Існаваў у 1937—41 у Мінску. Першы на Беларусі прафес. калектыў падобнага тыпу. Маст. кіраўнік І.*Любан*, хормайстар Н.*Сакалоўскі*, балетмайстар К.*Алексютовіч*. Рэпертуар уключаў апрацоўкі бел. нар. песень, арыгінальныя песні пераважна бел. кампазітараў, бел. і інш. нар. танцы, вак.-харэагр. карцінкі. Удзельнік Дэкады бел. мастацтва ў Маскве (1940). Адыграў вял. ролю ў прапагандзе традыц. і сучаснага песеннага і танц. бел. фальклору.

*Літ.*: Ансамбль Белорусской народной песни и пляски Государственной филармонии БССР. Мн., 1939. *Л.К.Алексютовіч.*

**АНСА́МБЛЬ НАРО́ДНАГА ТА́НЦА РАСІІ**, адзін з буйнейшых харэагр. калектываў Расіі. Створаны ў 1937 у Маскве, да 1991 наз. Ансамбль нар. танца СССР, з 1965 акадэмічны. Арганізатар і маст. кіраўнік І.*Майсееў*.

У рэпертуары танцы народаў свету, у т.л. бел. («Лявоніха», «Бульба», «Юрачка», «Янка»), канцэртныя мініяцюры, харэагр. сюіты, фальклор. цыклы («Партызаны», «Руская сюіта», малд. сюіта «Жок», укр. сюіта «Вяснянкі», «Карцінкі мінулага», «Танцы славянскіх народаў», «Па краінах свету», праграма «Дарога да танца» і інш.), што сталі ўзорамі ў галіне мастацтва нар. танца і з'яўляюцца вынікам зліцця самабытнай нар. творчасці з акад. асновай танца. Выступае ў суправаджэнні малога сімф. аркестра, у складзе якога група нар. інструментаў. Пры ансамблі працуе школа-студыя.

**АНСА́МБЛЬ ПЕ́СНІ І ТА́НЦА**, вялікі выканальніцкі калектыў, які складаецца з вакальнай, харэаграфічнай і аркестравай груп і аб'ядноўвае ў выступленнях розныя віды і жанры муз. і харэагр. мастацтва. Група нумароў часта ўтварае тэматычную вак.-харэагр. кампазіцыю, звычайна з элементамі тэатралізацыі. Вядзе гісторыю ад *Ансамбля песні і танца Расійскай Арміі* імя А.В.Аляксандрава (з 1928), набыў папулярнасць у многіх краінах («Мазоўша» і «Шлёнск» у Польшчы; «Слук» у Чэхіі; «Кола» ў Югаславіі і інш.). На Беларусі вядомы: *Ансамбль беларускай народнай песні і танца Беларускай філармоніі*, Бел. ансамбль песні і танца пад кіраўніцтвам Р.Шырмы (гл. *Дзяржаўны акадэмічны народны хор Рэспублікі Беларусь*), *Ан-*

*самбль песні і танца Узброеных сіл Рэспублікі Беларусь*, ансамбль *«Белыя росы»*, шматлікія самадзейныя калектывы.

**АНСА́МБЛЬ ПЕ́СНІ І ТА́НЦА РАСІ́ЙСКАЙ А́РМІІ** імя А.В.Аляксандрава, вялікі армейскі мастацкі калектыў; даў пачатак развіццю новага віду масавага мастацтва — *ансамбля песні і танца*. Створаны ў 1928 пры Цэнтр. Доме Чырв. Арміі, з 1978 акадэмічны. Арганізатар і першы маст. кіраўнік А.В.*Аляксандраў*, у 1946—86 маст. кіраўнік і гал. дырыжор Б.А.*Аляксандраў*.

У рэпертуары творы рас. кампазітараў пераважна ваен.-патрыят. тэматыкі, нар. песні і танцы, творы рус. і замежнай класікі. Найб. папулярнасць у выкананні ансамбля набылі песні «Свяшчэнная вайна» А.В.Аляксандрава і «Калінка» ў яго апрацоўцы. У складзе ансамбля мужчынскі хор, аркестр і танц. група.

**АНСА́МБЛЬ ПЕ́СНІ І ТА́НЦА УЗБРО́ЕНЫХ СІЛ РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ.** Існуе з 1938, да 1992 наз. Ансамбль песні і танца Бел. ваен. акругі. Арганізатар і першы маст. кіраўнік А.*Усачоў*. З 1949 базіруецца ў Мінску. У складзе ансамбля мужчынскі хор, танц. група і эстрадна-сімф. аркестр. Маст. кіраўнік і гал. дырыжор У.Ермалаеў (з 1994), гал. хормайстар Б.*Кір'янаў*; сярод салістаў А.*Кузняцоў*, У.*Яскевіч* і інш.

У рэпертуары ваен.-патрыят. творы, рус. і зарубежная класіка, сучасная эстрадная музыка, бел., рус. і ўкр. нар. песні і танцы, творы бел. кампазітараў, вак.-харэагр. кампазіцыі. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі 1978. Гастраліраваў у Францыі, Германіі, Польшчы і інш.

**АНСА́МБЛЬ ТА́НЦА**, вялікі выканальніцкі калектыў, які складаецца з харэагр. і аркестравай груп і мае на мэце прапаганду харэагр. фальклору, развіццё нар.-сцэнічнага танца. У рэпертуары танцы, тэматычныя харэагр. кампазіцыі, сюжэтныя пастаноўкі з элементамі тэатралізацыі. Першы прафес. А.т. — *Ансамбль народнага танца Расіі* (1937). На Беларусі найб. вядомыя калектывы падобнага тыпу: Ансамбль танца Мінскага клуба КІМ пад кіраўніцтвам К.*Алексютовіча* (1926—30), танц. калектыў пад кіраўніцтвам А.*Рыбальчанкі* (з 1936), *Дзяржаўны ансамбль танца Рэспублікі Беларусь* (з 1959), харэагр. ансамблі *«Харошкі»*, *«Чараўніцы»* і інш., шматлікія самадз. калектывы.

**АНСА́МБЛЬ ТА́НЦА** Мінскага клуба КІМ, першы на Беларусі самадзейны маладзёжны харэаграфічны калектыў. Існаваў у 1926—30. Маст. кіраўнік К.*Алексютовіч*. У рэпертуары пастаўленыя ім нар. і сцэнічныя танцы (сцэн. варыянты традыц. бел. танцаў «Мікіта», «Лянок», «Казачок», «Лявоніха», «Крыжачок», «Мяцеліца», «Юрачка»), харэагр. карцінкі і сюжэтныя танцы сучаснай тэматыкі. Адыграў важную ролю ў справе далучэння прац. моладзі да маст. культуры.

*Л.К.Алексютовіч.*

**АНСЕРМЭ́** (Ansermet) Эрнест (11.11.1883, г. Веве, Швейцарыя — 20.2.1969), швейцарскі дырыжор, кампазітар. У 1915—23 муз. кіраўнік трупы *«Рускі балет С.Дзягілева»*. Арганізатар і кіраўнік (з 1918) аркестра Раманскай Швейцарыі. Адзін з лепшых інтэрпрэтатараў музыкі франц. імпрэсіяністаў, а таксама І.Стравінскага (кіраваў першай паст. «Гісторыі салдата», 1918, Лазана, і інш.). Аўтар муз. твораў, кніг «Гутаркі аб музыцы» (1963, рус. пер. 1976); «Артыкулы аб музыцы і ўспаміны» (1971, рус. пер. 1986).

**АНСІ́МАЎ** Георгій Паўлавіч (н. 3.6.1922, ст. Ладажская Краснадарскага краю), рускі рэжысёр, педагог. Нар. арт. СССР (1986). У 1953—64, 1980—90 і з 1995 рэжысёр Вял. т-ра Расіі. У 1964—75 маст. кіраўнік і гал. рэж. Маскоўскага т-ра аперэты. З 1972 праф. Рас. акадэміі тэатр. мастацтва. Сярод пастановак: «Утаймаванне свавольніцы» В.Шабаліна (1957), «Аповесць пра сапраўднага чалавека» С.Пракоф'ева (1960). Паставіў «Вайну і мір» Пракоф'ева ў Празе (1970). Дзярж. прэмія СССР 1971.

**АНС-О-МЕ́ДАЎ** (L'Anse au Meadow), паселішча нарвежскіх вікінгаў на в-ве Ньюфаўндленд, адзінае вядомае ў Паўн. Амерыцы. Верагодна, пабудавана ў канцы 10 ст., калі, паводле скандынаўскіх сагаў, нарвежцы на чале з Лейвам Эрыксанам абследавалі ўзбярэжжа Амерыкі на З ад Грэнландыі. Раскопкамі выяўлены рэшткі дамоў, сцены якіх выкладзены з торфу, кузня з кавалкамі балотнай руды, жал. цвікі, прасліца.

**АНСЭ́ЙСКІЯ ДАГАВО́РЫ**, заключаны ў 1854—58 ЗША, Вялікабрытаніяй, Расіяй, Францыяй, Нідэрландамі з Японіяй у гады Ансэй [афіц. назва гадоў царавання (1854—60) імператара Камэй]. А.д. паклалі канец больш як двухвяковай ізаляцыі Японіі ад знешняга свету; устанавілі свабоду гандлю замежных купцоў з Японіяй і ўключылі яе ў міжнар. рынак, далі іншаземцам права экстэрытарыяльнасці і консульскай юрысдыкцыі, пазбавілі Японію мытнай аўтаноміі, навязалі нізкія ўвазныя пошліны. Спробы ўрада Японіі скасаваць нераўнапраўныя для яе А.д. не мелі поспеху да 1894, калі былі заключаны новыя дагаворы з Вялікабрытаніяй і інш. дзяржавамі. У гандл. пагадненнях 1911 адменены апошнія абмежаванні мытнай аўтаноміі Японіі.

**АНТА́БА** (ад ням. Handhabe ручка, рукаятка), металічнае кольца, якое прымацоўвалася да варот сядзібаў, дзвярэй дамоў, дзверцаў шафаў, куфраў і слу-

Антаба.

«Траецкая кадрыля» ў выкананні Ансамбля песні і танца Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

жыла ручкай. На Беларусі шырока бытавала ў 16—18 ст. Некаторыя па-мастацку аздобленыя А. (з металу, дрэва, каменю і тынку) маюць выгляд галавы льва з абручом у пашчы.

**АНТАБЛЕМЕ́НТ** (франц. entablement), верхняя частка збудавання, якая падтрымліваецца калонамі, пілястрамі або завяршае сцяну; элемент арх. *ордэра*. Падзяляецца на *архітраў*, *фрыз*, *карніз*. Узнік на аснове драўлянага бэлечнага перакрыцця, у сваіх формах адюстроўвае яго структуру. Сфарміраваўся ў класічных ордэрах манум. мураванай архітэктуры Стараж. Грэцыі і Рыма, дзе выпрацаваны яго прапорцыі. А. — адзін з важнейшых элементаў паярусnага члянення алтароў і іканастасаў.

**АНТАГАНІ́ЗМ** (ад грэч. antagōnisma спрэчка, барацьба), ідэйнае, паліт., маральнае і інш. процістаянне супрацьлеглых варожых сіл; адна з формаў супярэчнасцяў, што назіраюцца ў прыродзе і грамадстве. Адметная рыса А. — непрымірымы канфлікт процістаячых сіл, з'яў, тэндэнцый развіцця. Катэгорыя «А.» ужываецца ў біялогіі і матэматыцы, у грамадскіх навуках, у т.л. ў сац. філасофіі (творы класікаў і класавай барацьбы, грамадска-эканам. фармацый, цывілізацый, культур), паліталогіі (канфлікт паміж дэмакратыяй і таталітарызмам), гуманіст. і рэліг.-маральных філас. вучэннях (барацьба ліній дабра і зла, плоці і духу). У развіцці сучаснай цывілізацыі, калі супярэчнасці паміж ёю і прыродай усё большыя, адзначаецца А. двух падыходаў да прыроды: спажывецкага (прымат непадзельнага панавання чалавека над навакольлем) і рэгенерацыйнага (прымат гарманічнага ўзаемадзеяння грамадства з прыродай). *В.І.Боўш.*

А. у б і я л о г і і выяўляецца перш за ўсё ў *барацьбе за існаванне*. Найб. выразныя антаганіст. адносіны паміж драпежнікам і яго здабычай, гаспадаром і паразітам, а таксама канкурэнтныя ўзаемаадносіны (напр., за святло і мінер. жыўленне ў раслін, за кармы і месца пражывання ў жывёл). У ф і з і я л о г і і падобныя адносіны выяўляюцца ў разнастайнасці ўмоўна процілеглых функцый органаў або сістэм арганізма, якія ўдзельнічаюць у адначасовай спалучанай дзейнасці (актывацыя — інгібіраванне, узбуджэнне — тармажэнне, узмацненне — аслабленне, асіміляцыя — дысіміляцыя). А. р э ч ы в а ў — від узаемадзеяння амінакіслот, вітамінаў, гармонаў, *метабалітаў* і *антыметабалітаў* у арганізме, які характарызуецца палярным дзеяннем: узмацненнем ці аслабленнем пэўных рэакцый. А. м і к р а а р г а н і з м а ў выяўляецца ў тармажэнні або прыгнечанні жыццядзейнасці адных відаў мікраарганізмаў іншымі. Упершыню адзначыў франц. вучоны Л.Пастэр (1877). Найб. рэзкі А. сярод актынаміцэтаў, плесневых грыбоў, бактэрый; назіраецца таксама сярод дражджэй, водарасцяў і прасцейшых. Дзейнасць мікробаў-антаганістаў спрыяе ачышчэнню глебы ад патагенных мікраарганізмаў.

**АНТАГАНІ́СТЫ**, 1) у а н а т о м і і і ф і з і я л о г і і — органы з процілеглымі функцыямі і дзеяннем. Прыклады А.: мышцы і іх групы, што дзейнічаюць адначасова (або па чарзе) у двух процілеглых напрамках (напр., згінальнікі і разгінальнікі канечнасцяў — біцэпс і трыцэпс рукі чалавека), пара нерваў, якія пры ўзбуджэнні аказваюць процілеглы ўплыў на орган, што інервуецца. А. наз. таксама зубы верхняй і ніжняй сківіц, якія процістаяць адзін аднаму пры змыканні. 2) У м і к р а б і я л о г і і — мікраарганізмы, якія прыгнечваюць рост, развіццё і інш. праяўленні жыццядзейнасці інш. мікробаў і арганізмаў (гл. ў арт. *Антаганізм*).

**АНТАГЕНЕ́З** [ад грэч. on (ontos) існае + ...*генез*], індывідуальнае развіццё арганізма ад яго зараджэння да смерці (у аднаклетачных арганізмах да дзялення клеткі і ўтварэння новых асобін).

Антаблемент.

Уключае паслядоўныя марфал., біяхім., функцыян. пераўтварэнні, што ўзнікаюць на працягу існавання арганізма. З'яўляецца сціслым, кароткім паўторам (рэкапітуляцыяй) *філагенезу* (паводле Э.Гекеля, ням. заолага, які ўвёў тэрмін у 1866). Паводле сучасных уяўленняў, А. рэалізуецца па пэўнай праграме, закладзенай у кодзе спадчыннай інфармацыі. Усе новыя ў эвалюц. адносінах прыкметы ўзнікаюць у раннім А. і могуць перадавацца наступным пакаленням. Найбольш распаўсюджаны 3 тыпы А. жывёл: лічынкавы (развіццё з метамарфозай, непрамое), нелічынкавы (прамое развіццё, калі фарміраванне арганізма з зіготы адбываецца ў яйцы), унутрывантробнае развіццё (пры жывanараджэнні, калі фарміраванне дзіцяняці да нараджэння адбываецца ў яйцаводах і матцы мацярынскага арганізма). У кожным з тыпаў А. вылучаюць перыяды, якія адрозніваюцца формамі жыццёвай дзейнасці. Пераход з аднаго перыяду ў другі — пераломны момант у жыцці асобін. У жывёл, што размнажаюцца палавым шляхам, і ў чалавека адрозніваюць асн. перыяды: перадзародкавы (утварэнне палавых клетак у працэсе *гаметагенезу*), эмбрыянальнае развіццё (драбленне, гаструляцыя, аргана- і гістагенез) і пасляэмбрыянальнае развіццё. У рэгуляцыі А. ў шматклетачных жывёл і чалавека вял. роля належыць нерв. і эндакрыннай сістэмам. У раслін, якія размнажаюцца палавым шляхам, А. пачынаецца з развіцця аплодненай яйцаклеткі; характэрная яго асаблівасць — чаргаванне бясполага (*спарафіт*) і палавога (*гаметафіт*) пакаленняў. Пры вегетатыўным размнажэнні А. пачынаецца з дзялення саматычных клетак, у т.л. клетак спецыялізаваных органаў (клубняў, цыбулін, карэнішча і інш.). Цэласнасць раслін у А. забяспечваюць фітагармоны і абмен метабалітамі паміж рознымі іх органамі. Залежна ад умоў навакольнага асяроддзя ў А. раслін магчымы перыяды спакою, інтэнсіўнага росту і інш.

**АНТАКО́ЛЬСКІ** Марк Мацвеевіч (2.11.1843, Вільня — 9.7.1902), рускі скульптар. Вучыўся ў Пецярбургскай АМ (1862—68). Зблізіўся з *перасоўнікамі*. Аўтар твораў на гіст. тэмы, у якіх выявіліся яго грамадз. погляды, імкненне да псіхалагізацыі вобраза, праўдзівасці дэталяў («Іван Грозны», 1871, «Пётр I», 1872, «Ярмак», 1891). У шэрагу работ філас.-этычную праблематыку трактаваў у духу пошукаў ідэалаў праўды і справядлівасці («Хрыстос перад судом народа», 1876), іншы раз з рысамі сентыментальнасці («Не гэтага свету», 1887).

**АНТАКО́ЛЬСКІ** Павел Рыгоравіч (1.7.1896, С.-Пецярбург — 9.10.1978), рускі паэт. Вучыўся ў Маскоўскім ун-це. Быў рэжысёрам у тэатры імя Я.Вахтангава. Першая кніга вершаў выйшла ў 1922. Імкненне да гіст. абагульненняў вызначаюць зб-кі «Захад» (1926), «Трэццяя кніга» (1927), паэмы «Рабесп'ер і Гаргона» (1928), «Камуна 1871 года» (1933), «Франсуа Віён» (1934). Сав. рэчаіснасці прысвечаны паэмы «Чкалаў» (1942), «Сын» (1943, Дзярж. прэмія СССР, 1946), «У завулку за Арбатам» (1954). Аўтар зб-каў вершаў «Дзесяць гадоў» (1953), «Пра Пушкіна» (1960; вершы, пераклады, артыкулы), «Чацвёртае вымярэнне» (1964), «Аповесць мінулых гадоў» (1969). Пісаў літ.-крытычныя артыкулы, нарысы.

*Тв.*: Собр. соч. Т. 1—4. М., 1971—73. Бел. пер. — у кн.: Анталогія рускай савецкай паэзіі. Мн., 1936; Руская савецкая паэзія. Мн., 1953.

**АНТАЛІКІ́ДАЎ МІР**, ц а р с к і м і р, заключаны ў 387 (ці 386) да н.э. паміж Спартай і кааліцыяй грэч. полісаў на

чале з Афінамі і Фівамі пасля *Карынфскай вайны* 395—387. Падпісаны спартанскім дыпламатам Анталкідам (адсюль і назва міру). Паводле А.м. ўсе грэч. гарады на малаазіяцкім узбярэжжы і Кіпры пераходзілі пад уладу персаў, забараняліся саюзы дзяржаў, акрамя Пелапанескага. Кантроль за выкананнем умоў А.м. ўскладаўся на Спарту, што забяспечвала яе гегемонію над Грэцыяй.

**АНТАЛО́ГІЯ** [ад грэч. on (ontos) існае + *...логія*)], раздзел філасофіі, вучэнне аб *быцці*. Даследуе сутнасць быцця, яго універсальныя, усеагульныя асновы, заканамернасці і структуры. Тэрмін уведзены ням. філосафам Р.Гакленіусам (1613) у значэнні «космас», «прырода», «прадметны свет» (у аднозненне ад гнасеалогіі — вучэння аб пазнанні). Пазней сталі выкарыстоўваць і ў дачыненні да чалавека і яго свядомасці, вызначэнні анталагічнага зместу паняццяў, што набылі формы пазнання.

На розных этапах развіцця філасофіі бытавала думка, што свет, які ўспрымаецца пачуццём, несапраўдны і трэба шукаць пастаянны свет існага быцця, які можна спасцігнуць толькі розумам. Быццё як саматоесную існасць Парменід уяўляў нязменным, адзіным і супрацьпастаўляў яго пачуццёваму, множнаму, рухомаму. Арыстоцель уключаў у А. станаўленне, рух, якія ён звязваў з пераходам магчымасці ў рэальнасць. Філосафы сярэднявечча вырашалі праблемы ўзроўняў быцця (актуальны, патэнцыяльны, субстанцыяльны і інш.). Матэрыялістычная А. новай філасофіі разглядае асвоеную чалавекам з дапамогай навукі і тэхнікі прыроду, матэрыяльна-прадметную рэальнасць па-за чалавекам. Паварот ад прыродна-натуралістычнай да суб'ектыўна-гнасеалагічнай трактоўкі быцця з улікам вопыту суб'екта зроблены ў філасофіі Р.Дэкарта, І.Канта, І.Фіхтэ, Г.Гегеля і інш. Паводле К.Маркса, адзінства прыроднага і чалавечага быцця дасягаецца ў працэсе сац. дзеяння, якое ахоплівае і матэрыяльную, і духоўную вытв-сць. М.Хайдэгер, спалучаючы сэнс быцця з быццём чалавека, асабліве значэнне ў А. надаваў часу, мове (як «дому быцця»), культуры. Сучасны стан А. абумоўлены гіст. этапам развіцця грамадства з уласцівай яму на гэтым узроўні спецыфікай узаемасувязі быцця і свядомасці супярэчнасцямі паміж імі. Адна з гэтых супярэчнасцяў у тым, што прыроданавук. і сацыялагічным маделям не заўсёды можна знайсці адпаведнасці ў прыродзе і грамадстве. Другая супярэчнасць звязана з працэсамі інтэграцыі грамадскага быцця ў агульначалавечае з узвышэннем да яго ўзроўню нац., рэгіянальных інтарэсаў, ідэй і культуры. Гэта абвастрае праблематыку А., але павышае яе актуальнасць, асабліва ролю ўсеагульнасці, навук. спасціжэнне якой дазваляе чалавеку (яго свядомасці) правільна арыентавацца ў розных абставінах.

*Літ.*: Лосев А.Ф. Философия. Мифология. Культура. М., 1991; Хайдеггер М. Время и бытие: Статьи и выступления. Пер. с нем. М., 1993; Широканов Д.И. Основные этапы становления единства и развития как логических принципов // Принципы единства и развития в научном познании. Мн., 1988; Петрущик А.И. Перспективы единства мышления и бытия в современном мире // Научно-технический прогресс: взаимодействие факторов и тенденции развития. Мн., 1989; Алексеева Е.А. Разум и онтология сознания // Стереотипы и динамика мышления. Мн., 1993.

*А.І.Пятрушчык, Д.І.Шыракана́ў.*

**АНТАЛО́ГІЯ** (грэч. anthologia літар. букет кветак), зборнік літаратурных твораў (пераважна аднаго жанру) розных аўтараў пэўнай літаратуры, перыяду, літаратурнага кірунку і г.д. Вядомая са стараж. часоў на Усходзе і ў Грэцыі (складальнікам першай А. лічаць грэч. паэта Мелеагра, 60 да н.э.). Бел. А. бярэ пачатак ад стараж.-рускіх («Ізборнікі Святаслава» 1073, 1076). Адна з першых А. новага часу — «Дыяменты беларускага прыгожага пісьменства» (1919). У Беларусі выйшлі «Анталогія беларускай паэзіі» (т. 1—3, 1961; т. 1—3, 1993), «Анталогія беларускага апавядання» (т. 1—2, 1967), А. бел. дзіцячай л-ры «Арлянятам» (т. 1—2, 1967), «Анталогія беларускай народнай песні» (1968; 2-е выд. 1975), А. «Беларуская балада» (1978).

М.Антакольскі. Іван Грозны. 1871. Нацыянальны мастацкі музей Беларусі.

Верхняя частка г. Антананарыву.

**АНТА́ЛЬЯ** (Antalya), Адалія, горад на Пд Турцыі. Адм. ц. іля Анталья. 378 тыс. ж. (1990). Порт на Міжземным м. Металургічная, тэкст., харч., дрэваапр. прам-сць, суднабудаванне. Музеі. Турызм.

**АНТАНАНАРЫ́ВУ** (Antananarivo), Тананарыве, горад, сталіца, гал. эканам. і культ. цэнтр *Мадагаскара*. Адм. ц. правінцыі Антананарыву. 802 тыс. ж. (1990). Размешчаны на плато ў цэнтр. ч. в-ва Мадагаскар, на выш. 1200—1400 м над узр. мора. Вузел чыгунак і аўтадарог. Міжнар. аэрапорт Івату. Харчасмакавая, гарбарная, абутковая, хім., дрэваапр., тэкст., паліграф. прам-сць; вытв-сць буд. матэрыялаў, аўтазборачны з-д і інш. Ун-т.

Засн. ў 1-й пал. 17 ст. каралём дзяржавы Імерына Андрыянзакам. У 17—19 ст. рэзідэнцыя каралёў Мадагаскара. У 1895 захоплены французамі, з 1896 адм. цэнтр франц. калоніі, з 1960 сталіца Мадагаскара. Музеі (у т.л. малагасійскага мастацтва).

**АНТАНЕ́ВІЧ** Анатоль Барысавіч (н. 9.1.1942, в. Мелаватка Валгаградскай вобл., Расія), бел. матэматык. Д-р фіз.-матэм. н. (1989), праф. (1991). Скончыў БДУ (1963), дзе працуе з 1967. Навук. працы па функцыян. аналізе і дыферэнцыяльных ураўненнях. Распрацаваў новы падыход у даследаванні функцыянальна-дыферэнцыяльных ураўненняў і нелакальных краявых задач, заснаваных на вывучэнні адпаведных аператарных алгебраў. Адзін з аўтараў «Руска-беларускага матэматычнага слоўніка» (1993).

*Тв.*: Функциональный анализ и интегральные уравнения. Мн., 1984 (разам з Я.В.Радынам); Линейные функциональные уравнения: Оператор. подход. Мн., 1988; Functional differential equations: I.C. -theory. New York, 1994 (разам з А.У.Лебедзевым).

**АНТАНЕ́ВІЧ** (Antoniewicz) Ежы (3.5.1919, Пётркаў-Трыбунальскі, Пётркаўскага ваяв., Польшча — 29.6.1970), польскі гісторык і археолаг. Д-р гіст. н. (1961). Скончыў Варшаўскі ун-т (1946). Працаваў у Дзярж. археал. музеі ў Варшаве. Арганізатар і кіраўнік Ятвяжскай і Ятвяжска-Сувалкаўскай археал. экспедыцый. Рэдактар штогодніка «Acta Baltico-Slavica» па агульных праблемах гісторыі польскага, літ. і бел. народаў.

*Літ.*: Cieslak T. Jerzy Antoniewicz (1919—1970) // Rocznik Białostocki. Warszawa, 1971. T. 10.

**АНТАНЕ́ВІЧ** (Antoniewicz) Уладзімеж (15.7.1893, г. Самбар Львоўскай вобл., Украіна — 1968), польскі археолаг. Праф. (1920), правадз. чл. Польскай АН (з 1952). У 1925—33 выкладаў у Віленскім ун-це, у 1936—39 рэктар Варшаўскага ун-та і кіраўнік кафедры археалогіі. Вывучаў помнікі мезаліту на тэр. Зах. Беларусі. У 1934 удзельнічаў у навук. канферэнцыі ў Мінску. Аўтар прац па археалогіі, нар. мастацтве, музейнай справе, у т.л. даследавання пра залатыя

рымскія соліды 3—4 ст. *Браслаўскага скарбу.*

**АНТАНЕ́ЛА ДА МЕСІ́НА** (Antonello da Messina; каля 1430, г. Месіна, Сіцылія — паміж 14 і 25.2.1479), італьянскі жывапісец ранняга Адраджэння. Прадстаўнік *Венецыянскай школы жывапісу.* Працаваў пераважна ў Месіне. Запазычыўшы ў нідэрл. мастакоў тэхніку

М.Антаніёні.

алейнага жывапісу, дасягнуў надзвычайнай глыбіні колеру, выкарыстаў асвятленне як маст.-выразны сродак. Створаныя ім вобразы адметныя велічным спакоем, класічнай раўнавагай. Значны ўклад яго ў станаўленне рэнесансавага рэаліст. партрэта. Асн. творы: т. зв. аўтапартрэт (каля 1473), «Распяцце» (1477), фрагменты алтара з царквы Сан-Касіяна ў Венецыі (1475—76), «Святы Себасцьян» (1475) і інш.

*Я.Ф.Шунейка.*

**АНТАНЕ́НКА-ДАВІДО́ВІЧ** Барыс Дзмітрыевіч (5.8.1899, г. Рамны Сумскай вобл., Украіна — 9.5.1984), украінскі пісьменнік. Скончыў Кіеўскі ін-т нар. асветы (1923). Падзеі рэвалюцыі 1917, грамадз. вайны, аднаўленчы перыяд адлюстраваў у зб-ках апавяданняў, нарысаў і аповесцяў «Зацярушаныя сілуэты» (1925), «Сіняя валошка» (1927), «Смерць» (1928), «Сапраўдны муж» (1929), «Людзі і вугаль» (1932). Маральна-этычная тэматыка ў рамане «За шырмай» (1957), зб. апавяданняў і аповесцяў «Слова маці» (1960). Аўтар публіцыст., літ.- і мовазнаўчых артыкулаў (зб-кі «Аб чым і як», 1962; «У літаратуры і каля літаратуры», 1964; «Як мы гаворым», 1970). Рэпрэсіраваны ў 1935, рэабілітаваны ў 1956. Дзярж. прэмія Украіны імя Т.Шаўчэнкі 1992 (за зб-кі прозы розных гадоў «Смерць», «Сібірскія навелы», «Завышаныя ацэнкі», публ. 1991).

*Тв.*: Твори. Т. 1—2. Київ, 1991.

*В.А.Чабаненка.*

**АНТАНЕ́СКУ** (Antonescu) Іон (14.6.1882, г. Пітэшты, Румынія — 1.6.1946), дзяржаўны і ваенны дзеяч Румыніі, маршал (1941). У 1933—34 нач. Ген. штаба, у 1937—38 міністр абароны. З вер. 1940 дыктатар Румыніі. У ліст. 1940 падпісаў пагадненне пра далучэнне Румыніі да восі Берлін—Рым—Токіо, у саюзе з фаш. Германіяй пачаў вайну супраць СССР. У час нар. паўстання 1944 арыштаваны. Як ваенны злачынец пакараны смерцю паводле прыгавору нар. трыбунала Бухарэста.

**АНТАНІЁНІ** (Antonioni) Мікеланджэла (н. 29.9.1912, г. Ферара, Італія), італьянскі кінарэжысёр. Скончыў Вышэйшую школу эканомікі і камерцыі ў Балонні. Асн. тэма творчасці — даследаванне ўнутр. свету чалавека, які адчувае сваю ізаляванасць, пакінутасць, адзіноту і боязь жыцця. У пасляваен. эпоху паказаў раз'яднанасць людзей, іх трагічную «некамунікабельнасць». Героі яго стужак пакутліва перажываюць сваю ўнутраную самоту: «Хроніка аднаго кахання» (1950), «Пераможаныя» (1952), «Дама без камелій» (1953), «Сяброўкі» (1955). Своеасаблівы цыкл складаюць фільмы 1960-х г., у якіх паказаны разрыў кантакту герояў з рэальнасцю, унутраны крызіс: «Крык» (у сав. пракаце «Адчай»), «Ноч», «Зацьменне», «Чырвоная пустыня». Майстэрскае вы-

Антанела да Месіна. Святы Себасцьян. 1475.

карыстанне натуральных шумаў, паўз, сімвалічных дэталяў робіць фільмы А. гукапластычным відовішчам. У інш. краінах зняў фільмы: «Фотапавелічэнне» (Англія, 1967), «Забрыскі Пойнт» (ЗША, 1970), «Прафесія: рэпарцёр» (Алжыр, 1975).

*Літ.*: Антониони об Антониони: Статьи, эссе; Интервью; Тот кегельбан над Тибром. *Тв.*: Рус. пер. — М., 1986. *В.Ф.Нячай.*

**АНТАНІМІ́Я**, тып семантычных адносін лексічных адзінак, якія маюць процілеглае значэнне (антонімаў). Антанімічныя пары належаць да адной часціны мовы: назоўнікаў («дабро — зло»), прыметнікаў («шырокі — вузкі»), дзеясловаў («браць — аддаваць»), прыслоўяў («далёка — блізка»). Паводле структуры падзяляюцца на аднакарэнныя («замкнуць — адамкнуць») і рознакарэнныя («сумны — вясёлы»). Вылучаюць поўную, няпоўную (частковую) і кантэкстуальную А. Поўныя антонімы адрозніваюцца ўсімі сваімі значэннямі («будаваць — разбураць»); частковыя супрацьпастаўляюць па адным або некалькіх значэннях («радасць — смутак»); кантэкстуальныя ўспрымаюцца толькі ў пэўным кантэксце: «**Ласка** і **гнеў**, **ціша** і **бура**! Я вітаю вас, калі вы прыходзіце ў сваім часе, калі выконваеце вы адвечную волю жыцця» (Я.Колас). Мнагазначнае слова можа мець антонімы да кожнага ці некалькіх сваіх значэнняў («глыбокая рака — мелкая рака», «глыбокія веды — павярхоўныя веды»). А. не ўласцівая словам з канкрэтным значэннем («шафа», «бяроза», «стадыён»), вузкаспец. тэрмінам, уласным імёнам, лічэбнікам, займеннікам і службовым словам. *Г.К.Усціновіч.*

**АНТАНІ́НАЎ ВАЛ** (англ. Antonine Wall), старажытнарымскае абарончае збудаванне паміж нізоўямі р. Клайд і залівам Ферт-оф-Форт у Шатландыі. Пабудаваны ў 145 н.э. Лоліем Урбікам у час праўлення імператара Антаніна Пія для абароны паўн. межаў Рымскай імперыі ад варвараў. Мае 19 асн. і шэраг дадатковых фортаў па-за межамі вала для абароны флангаў. Выш. 3 м, шыр. каля 4,5 м, з паўн. боку ўмацаваны ровам. У 155 А.в. часова пакінуты, у канцы 2 ст. закінуты канчаткова.

**АНТАНІ́НЫ** (Antonini), дынастыя рымскіх імператараў, якая правіла ў 96—192. Назва ад імя імператара Антаніна Пія. Заснавальнік дынастыі — Нерва [96—98].

Да А. належалі: Траян [98—117], *Адрыян* [117—138], Антанін Пій [138—161], Марк *Аўрэлій* [161—180] і яго суправіцель Луцый Вер [161—169], Камод [180—192]. Часы праўлення А. лічацца «залатым векам» імперыі. Для іх характэрны спалучэнне манархіі і свабоды, эканам. і культ. развіццё правінцый, буд-ва новых гарадоў, пераможныя войны, раздача рым. грамадзянства і інш.

**АНТАНІ́ШЫН** Мікалай Васілевіч (н. 29.5.1931, Мінск), бел. вучоны ў галіне цеплаэнергетыкі. Д-р тэхн. н. (1975), праф. (1983). Скончыў БПІ (1956). З 1958 у Ін-це цепла- і масаабмену АН Беларусі, у 1968—71 нам. дырэктара гэтага ін-та. Навук. даследаванні па працэсах цеплаабмену ў дысперсных асяроддзях. Распрацаваў тэорыю цепла- і масаперанесу на мяжы з дысперсным слоем, прапанаваў метады вымярэння

цеплааддачы ад паверхні да псеўдазвадкаванага слоя.

*Тв.*: Heat transfer in dispersed media (разам з У.В.Лушчыкавым) // Transport in fluidized particle systems. Amsterdam etc., 1989.

*Літ.*: Профессор Н.В.Антонишин: (к 60-летию со дня рождения) // Энергетика. 1991. № 10.

**АНТАНО́ВІЧ** Антон Канстанцінавіч (6.6.1910, в. Казлы Нясвіжскага р-на Мінскай вобл. — 27.12.1980), бел. моўназнавец. Д-р філал. н. (1969). Скончыў Віленскі ун-т (1950), выкладаў у ім (1950—71). Даследаваў помнікі татарамусульманскага пісьменства на бел. мове («Беларускія тэксты, пісаныя арабскім пісьмом, і іх графіка-арфаграфічная сістэма», 1968), фанетыку, графіку і арфаграфію судовай (актавай) кнігі Ковенскага земскага суда 1566—67. Выявіў 24 рукапісныя кнігі 17 — пач. 20 ст. на бел. мове араб. пісьмом. Працы А. паказваюць суадносіны бел. літ. і жывой гутарковай мовы розных часоў, фанетычныя, граматычныя і лексічныя асаблівасці нар. бел. гаворак.

*І.У.Саламевіч.*

**АНТАНО́ВІЧ** Іван Іванавіч (н. 3.4.1937, в. Дамашы Ляхавіцкага р-на Брэсцкай вобл.), бел. філосаф. Д-р філас. н. (1973), праф. (1977). Скончыў Мінскі пед. ін-т замежных моў (1960). У 1959—60 у Ін-це філасофіі і права АН Беларусі, Бел. Энцыклапедыі. Быў супрацоўнікам Сакратарыята ААН, пастаянным прадстаўніком Беларусі пры ЮНЕСКА. У 1977—87 на парт. рабоце, з 1987 прарэктар Акадэміі грамадскіх навук пры ЦК КПСС, у 1990—91 сакратар ЦК Кампартыі РСФСР. У 1993—95 дырэктар Бел. ін-та навук.-тэхн. інфармацыі і прагнозу. З 1995 нам. міністра замежных спраў Рэспублікі Беларусь. Даследуе праблемы гісторыі сац. філасофіі, сацыялогіі, тэорыі палітыкі. Аўтар прац «Сучасная «філасофская антрапалогія» (1970), «Сацыяльнае развіццё і праблема прагрэсу» (1977), «Буржуазная сацыялагічная тэорыя» (ч. 1—2, 1980—81), «Сучасны капіталізм: Сацыядынаміка ўлады» (1990), «Сацыядынаміка ідэалогій» (1995) і інш.

**АНТАНО́ВІЧ** Максім Аляксеевіч (9.5.1835, г. Белаполле Сумскай вобл., Украіна — 14.11.1918), расійскі філосаф, публіцыст, літ. крытык. Скончыў Пецярбургскую духоўную акадэмію (1859). З 1861 літ. крытык час. «Современник». Крытыкаваў агнастыцызм Канта і Шапенгаўэра, пазітывізм і гегельянства рус. філосафаў-ідэалістаў, славянафільскія ідэі нац. выключнасці, тэорыю «чыстага мастацтва». Яго светапогляд будаваўся на антрапал. прынцыпе, паводле якога чалавек — цэнтр сусвету, вянец прыроды, зыходны пункт вывучэння аб'ектыўнай рэальнасці; адсюль неабходнасць пашырэння ведаў, паляпшэння ўмоў жыцця людзей, правядзення сац. пераўтварэнняў.

*Тв.*: Избранные статьи. Л., 1938; Избранные философские сочинения. М., 1945; Литературно-критические статьи. М.; Л., 1961.

**АНТАНО́ВІЧ** Уладзімір Баніфатавіч (30.1.1834, с. Камсамольскае Вінніцкай вобл., Украіна — 21.3.1908), украінскі гісторык, археолаг, этнограф, археограф; адзін з заснавальнікаў укр. нац. гістарыяграфіі. Праф. Кіеўскага ун-та (з 1878). У 1863—80 гал. рэд. Часовай камісіі для разбору стараж. актаў у Кіеве, з 1881 старшыня гіст. т-ва Нестара-летапісца. Апублікаваў шэраг мемуарных і эпісталярных крыніц, у тл. «Дыярыуш» Ф.Еўлашоўскага, «Гістарычныя песні маларускага народа» (т. 1—2, 1874—75, з М.П.Драгаманавым). Працы па гісторыі Украіны, Беларусі і Літвы склалі зб. «Манаграфіі па гісторыі Заходняй і Паўднёва-Заходняй Расіі» (т. 1, 1885). Аўтар прац па археалогіі Украіны. Падкрэсліваў бяскласавасць і дэмакратызм укр. народа, ідэалізаваў казацтва.

*Дз.У.Караў.*

**АНТА́НТА** (франц. Entente літар. згода), ваенна-паліт. блок Вялікабрытаніі, Францыі, Расіі (Траістая згода), афармлены ў 1904—07; у 1-ю сусв. вайну аб'яднаў супраць герм. кааліцыі 25 дзяржаў. З узнікненнем А. фактычна закончыўся падзел дзяржаў Еўропы на 2 варожыя лагеры. Германія, значэнне якой у Еўропе вырасла пасля перамогі ў *франка-прускай вайне 1870—71*, падпісала ў 1879 саюз з Аўстра-Венгрыяй. У 1882 да яго далучылася Італія. Гэтым завяршылася стварэнне *Траістага саюза* 1879—82. У адказ Францыя і Расія заключылі франкарускі саюз 1891—93. Англія спрабавала застацца ў баку ад блокаў і быць міжнар. арбітрам, але ўзмацненне англа-герм. супярэчнасцяў прымусіла яе падпісаць англа-франц. (1904) і англа-рус. (1907) пагадненні, якія фактычна аформілі стварэнне А. Расія і Францыя мелі ў гэтай групоўцы пэўныя ваен. абавязацельствы (Англія ад іх адмовілася). Рознагалоссі паміж удзельнікамі А. часткова былі згладжаны, але канчаткова не ліквідаваны. Іх спрабавала выкарыстаць Германія, каб вывесці з групоўкі Расію. Але гэтаму перашкаджала залежнасць Расіі ад франц. капіталу і ваен. пагроза з боку Германіі. У той жа час А. імкнулася ізаляваць ад Траістага саюза Італію (у маі 1915 апошняя перайшла на бок А.) і Аўстра-Венгрыю. На пач. 1-й сусв. вайны ўдзельнікі А. выступілі разам і ў вер. 1914 падпісалі пагадненне аб незаключэнні сепаратнага міру з Германіяй. У кастр. 1915 да пагаднення далучылася Японія і абвясціла вайну Германіі. У ходзе вайны да А. далучылася яшчэ 20 дзяржаў. Асноўны цяжар вайны неслі Расія і Францыя, на тэрыторыі якіх вяліся ваен. дзеянні. Пасля Кастр. рэвалюцыі 1917, калі Расія выйшла з А., Англія і Францыя падпісалі пагадненне (23.12.1917) пра сумесную інтэрвенцыю ў Сав. Расію і падзел яе тэрыторыі. А. была ініцыятарам паходаў супраць Сав. дзяржавы (гл. *Грамадзянская вайна і ваенная інтэрвенцыя ў Расіі 1918—20*). Абвастрэнне супярэчнасцяў паміж дзяржавамі А. пасля заканчэння 1-й сусв. вайны прывяло да распаду гэтага блока.

**АНТА́НТА БАЛКА́НСКАЯ**, саюз Грэцыі, Румыніі, Турцыі і Югаславіі. Заключаны 9.2.1934 у Афінах пад эгідай Францыі з мэтай захавання суадносін сіл на Балканах, што склаліся пасля 1-й сусв. вайны. Першапачаткова адпавядаў інтарэсам Францыі як сродак узмацнення яе пазіцый у краінах Паўд.-Усх. Еўропы. Дагавор аб стварэнні А.Б. прадугледжваў узаемную гарантыю бяспекі балканскіх граніц краін-удзельніц, а таксама ўзаемную дапамогу ў выпадку нападу на адну з іх. Дзеянні Германіі і Італіі, якія абапіраліся на фаш. групоўкі ў Грэцыі, Румыніі, Турцыі і Югаславіі, падарвалі франц. ўплыў на краіны А.Б., у 2-ю сусв. вайну яна распалася.

**АНТА́НТА МАЛА́Я**, палітычны блок Румыніі, Чэхаславакіі і Югаславіі ў 1920—38. Створана ў 1920—21 на аснове двухбаковых пагадненняў для захавання суадносін сіл, што склаліся ў Цэнтр. і Паўд.-Усх. Еўропе пасля 1-й сусв. вайны. Дзейнічала ў рэчышчы знешняй палітыкі Францыі, займала важнае месца ў яе сістэме ваенна-паліт. саюзаў. *Даўэса план 1924*, *Лакарнскія перагаворы 1925*, пазнейшае збліжэнне Румыніі з Англіяй, Венгрыяй і асабліва з Італіяй прывялі да аслаблення А.М. і ролі ў ёй Францыі. Пагроза з боку фаш. Германіі прыпыніла распад А.М. У 1933 саюзнікі падпісалі Арганізац. пакт пра неабмежаваны тэрмін дзеяння ўсіх пакладзеных у аснову А.М. дагавораў, стварылі савет А.М. і эканам. савет. У 1934 Румынія і Югаславія са згоды Чэхаславакіі ўвайшлі ў *Антанту Балканскую*. Дагаворы 1937 Югаславіі з Балгарыяй і Італіяй сталі прычынай новага крызісу ў сістэме А.М. *Мюнхенскае пагадненне 1938*, якое прывяло да акупацыі Чэхаславакіі Германіяй, спыніла існаванне блока.

**АНТА́НТА МІЖЗЕМНАМО́РСКАЯ**, палітычная групоўка Вялікабрытаніі, Аўстра-Венгрыі і Італіі супраць Расіі і Францыі. Аформлена ў 1887 двума сакрэтнымі пагадненнямі: 1-м — паміж Вялікабрытаніяй і Італіяй (12 лют.), Аўстра-Венгрыяй і Вялікабрытаніяй (24 сак.); 2-м — паміж Аўстра-Венгрыяй і Вялікабрытаніяй (12 снеж.), Вялікабрытаніяй і Італіяй (16 снеж.). 1-е пагадненне фармальна захоўвала статускво ў басейнах Міжземнага, Адрыятычнага, Чорнага, Эгейскага мораў і на ўзбярэжжы Паўн. Афрыкі, 2-е мела на мэце захаваць становішча, якое існавала на той час у М.Азіі, чарнаморскіх пралівах і ў Балгарыі (Вялікабрытанія імкнулася ўмацаваць свае пазіцыі ў Егіпце, Італія — у Трыпалітаніі і Кірэнаіцы, Аўстра-Венгрыя — на Балка-

нах). Стварэнню А.М. садзейнічаў канцлер Германіі Бісмарк, які разлічваў умацаваць становішча Аўстра-Венгрыі адносна Расіі, далучыць да *Траістага саюза 1882* Вялікабрытанію і перашкодзіць збліжэнню Францыі і Італіі. У выніку ўзмацнення ў канцы 19 ст. англа-герм. саперніцтва і аўстра-італьян. супярэчнасцяў А.М. страціла сваю сілу.

В.С.Антанюк.

**АНТАНЮ́К** Віталь Сцяпанавіч (н. 10.10.1939, г. Крамянчуг, Украіна), вучоны ў галіне жывёлагадоўлі. Акад. Акадэміі агр. навук Беларусі (1992), Акадэміі агр. навук Украіны (1992). Чл.-кар. УАСГНІЛ (1991). Д-р біял. н. (1985), праф. (1989). Скончыў Віцебскі вет. ін-т (1962). З 1974 дырэктар Бел. НДІ жывёлагадоўлі, ген. дырэктар НВА «Племэліта», з 1987 у Бел. ін-це механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі. З 1991 старшыня Бел. аддзялення УАСГНІЛ, адначасова нам. міністра сельскай гаспадаркі і харчавання. З 1992 прэзідэнт Акадэміі агр. навук Беларусі. Даследаванні па размнажэнні, развядзенні і біятэхналогіі с.-г. жывёл, тэхналогіях вытв-сці прадукцыі жывёлагадоўлі.

*Тв.*: Биотехнические способы повышения эффективности оплодотворения сельскохозяйственных животных. Мн., 1988; Основы интенсивных технологий производства молока и мяса. Мн., 1990 (разам з В.І.Сапегам, П.П.Ракецкім).

**АНТАНЮ́К** Георгій Аляксандравіч (н. 13.11.1942, в. Мацы Кобрынскага р-на Брэсцкай вобл.), бел. філосаф. Д-р філас. н. (1991), праф. (1993). Скончыў Ленінградскі ун-т (1970). З 1974 у Ін-це філасофіі і права, з 1980 на кафедры філасофіі АН Беларусі. Аўтар прац па праблемах сац. кіравання, сац. праектавання і міжэтнічных адносін: «Сацыяльнае праектаванне: (некаторыя метадалагічныя аспекты)» (1978), «Сацыяльнае праектаванне і кіраванне грамадскім развіццём: Тэарэтыка-метадалагічны аспект» (1986). Адзін з аўтараў кн. «Сацыяльна-філасофскія праблемы вытворчасці і выкарыстання навуковых ведаў» (1992) і інш.

**АНТАНЮ́К** Любоў Адамаўна (н. 28.4.1949, в. Ломыш Хойніцкага р-на Гомельскай вобл.), бел. моваznавец. Д-р філал. н. (1992). Скончыла Мазырскі пед. ін-т (1970). З 1974 у Ін-це мовазнаўства АН Беларусі, з 1991 у БДУ. Даследуе граматыку бел. мовы: «Станавыя значэнні сумеснасці і ўзаемнасці ў сучаснай беларускай літаратурнай мове» (1981), «Беларуская граматыка» (ч. 2, 1986; у сааўт.); станаўленне, развіццё і функцыянаванне бел. тэрміналогіі: «Беларуская навуковая тэрміналогія» (1987). Сааўтар «Руска-беларускага слоўніка лінгвістычных тэрмінаў» (1988), «Слоўніка лінгвістычных тэрмінаў» (1990). Вучоны сакратар Рэсп. тэрміналагічнай камісіі (з 1980), член Міжнар. арг-цыі па уніфікацыі тэрміналагічных неалагізмаў (МАУТН), віцэ-прэзідэнт Міжнар. федэрацыі тэрміналагічных банкаў (МФТБ).

**АНТАНЮ́К** Максім Антонавіч (1895, в. Мацы Кобрынскага р-на Брэсцкай вобл. — 30.7.1961), ваенны дзеяч, ген.-лейт. (1940). Скончыў Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1927). З 1915 у арміі, прапаршчык. З кастр. 1917 у Чырв. гвардыі, у грамадз. вайну пам. камандзіра палка, камандзір батальёна, Паўд. групы войскаў 5-й арміі, дывізій. Пасля вайны камандзір стралк. дывізій, нам. ген.-інспектара пяхоты Чырв. Арміі. Чл. ЦВК Узбекістана (1925), ЦВК БССР (1927). У Вял. Айч. вайну камандуючы 2-й, 3-й рэзервовымі і 48-й арміямі, групамі войск Ленінградскага фронту, на інш. камандных пасадах. Пасля вайны да 1947 нам. камандуючага войскамі Львоўскай ваен. акругі.

У Антарктыдзе.

Палярная станцыя Дзюмон-Дзюрвіль (Францыя) у Антарктыдзе.

**АНТАПО́ЛЛЕ**, вёска ў Беларусі, у Чашніцкім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Слідчаны». За 40 км на ПдУ ад Чашнікаў, 135 км ад Віцебска, 15 км ад чыг. ст. Вятны. 425 ж., 108 двароў (1994). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі, камбінат быт. абслугоўвання.

**АНТАРКТЫ́ДА**, мацярык у Паўднёвым паўшар'і, у межах Паўд. палярнага круга, займае цэнтр. частку *Антарктыкі*. Пл. 13 975 тыс. км$^2$ разам з астравамі і шэльфавымі ледавікамі (найб. Роса, Фільхнера, Роне і інш., агульнай пл. 1582 тыс. км$^2$). Пастаяннага насельніцтва няма. Берагі А. (даўж. больш за 30 тыс. км) парэзаны слаба. Пераважаюць ледавіковыя абрывы выш. 20—100 м. З боку Атлантычнага, Індыйскага і Ціхага ак. абмываюць А. моры Уэдэла, Лазарава, Рысер-Ларсена, Касманаўтаў, Садружнасці, Дэйвіса, Моўсана, Дзюрвіля, Роса, Амундсена, Белінсгаўзена. У напрамку да Паўд. Амерыкі цягнецца вузкі *Антарктычны паўвостраў*. У м. Роса ўзвышаецца дзеючы вулкан *Эрэбус* (3794 м).

**Ледавіковае покрыва і рэльеф**. А. ўкрыта магутным шчытом мацерыковага лёду, не занята ледавікамі 0,2—0,3% тэр. (асобныя горныя вяршыні, хрыбты, невял. ўчасткі сушы — *антарктычныя аазісы*). Агульная пл. зледзянення (пачалося 300 млн. г. назад) 2044 тыс. км$^2$, аб'ём лёду 24 млн. км$^3$. Сярэдняя тоўшча ледавіковага покрыва 1720 м, найб. — 4500 м. А. — самы высокі мацярык на Зямлі. Сярэдняя выш. з улікам ледавіковага покрыва 2040 м. Сярэдняя выш. карэннай падлёднай паверхні 410 м (значная ч. ляжыць ніжэй за ўзровень мора). Большая ч. А. — пласкагор'е. Трансантарктычныя горы ўздоўж разломаў ад м. Уэдэла да м. Роса перасякаюць амаль увесь мацярык і падзяляюць А. на Усх. і Заходнюю. Плато Савецкае займае цэнтр. ч. Усх. А. (выш. да 4000 м), на Пн паверхня зніжаецца і ўтварае нізіну Міжнар. геафіз. года. Уздоўж узбярэжжа горныя хрыбты Зямлі Вікторыі, Зямлі Каралевы Мод, горы Прынс-Чарлз і інш. Паверхня Зах. А. значна ніжэйшая, больш расчлянёная, хрыбты размешчаны ў глыбіні мацерыка і на ўзбярэжжы. Самы высокі горны масіў Вінсан (5140 м, у гарах Элсуэрт). Рэльеф карэннай скальнай паверхні А. — чаргаванне горных падняццяў (падлёдавыя горы Гамбурцава і Вярнадскага) і глыбокіх нізін.

**Геалагічная будова.** Большая ч. А. — *Антарктычная платформа*, астатняя належыць да антарктычнага складкавага пояса, які з'яўляецца працягласцю Андаў. Карысныя выкапні: каменны вугаль, жал., медныя і свінцовыя руды; знойдзены мінералы, у якіх ёсць бром, волава, марганец, малібдэн, радовішчы графіту, горнага хрусталю і інш.

**Клімат** А. кантынентальны антарктычны, халодны і суровы (гл. *Антарктычны клімат*). Пануюць антарктычныя паветраныя масы, фарміруецца *антарктычны антыцыклон*. Сярэднія т-ры зімой ад -20 да -30 °С на ўзбярэжжы і ад -60 да -70 °С ва ўнутр. раёнах; летам адпаведна ад -10 да -30 °С, -40 °С. Абсалютны мінімум т-ры -89,3 °С зафіксаваны ў цэнтр. ч. на ст. Усход (Полюс холаду Зямлі). Ападкі толькі ў выглядзе снегу: 30—50 мм у цэнтр. ч. А., 700—1000 мм на ўзбярэжжы за год. Моцныя штармавыя цыкланічныя і сцёкавыя вятры ў прыбярэжных раёнах дасягаюць скорасці 50—60, часам 90 м/с.

**Арганічны свет.** Для аазісаў характэрны ўмовы тыповых палярных пустыняў. Ёсць разнастайныя азёры (прэсныя і горка-салёныя). Свабодныя ад лёду ўчасткі ўзбярэжжа і скалы ўкрыты лішайнікамі, імхамі, водарасцямі (на Антарктычным п-ве — папарацепадобныя, каля 10 відаў кветкавых раслін). Фауна своеасаблівая і бедная: з птушак — пінгвіны, знойдзена некалькі відаў членістаногіх (кляшчы, нагахвосткі, ціхаходы і інш.).

Адкрыта А. 28.1.1820 рус. экспедыцыяй Ф.Ф.Белінсгаўзена і М.П.Лазарава. У пач. 20 ст. тут пабывалі Р.Скот, Э.Шэклтан, Р.Амундсен, Д.Моўсан і інш. У 1911 экспедыцыя Амундсена і ў 1912 Скота дасягнулі Паўд. полюса. У сувязі з Міжнар. геафіз. годам (1957—58) на мацерыку і прыбярэжных астравах створаны і дзейнічаюць 40 (1988) палярных станцый 16 краін свету, якія вядуць навук. даследаванні. Прававое становішча А. рэгулюецца Міжнар. дагаворам 1959.

*Літ.*: Каменев В.М. Заповедная Антарктика. Л., 1986; Бардин В. В горах и на ледниках Антарктиды. М., 1989.

*В.Ю.Панасюк.*

**АНТА́РКТЫКА**, паўднёвая палярная вобласць Зямлі, якая ўключае мацярык *Антарктыду* і прылеглыя да яго ўчасткі Атлантычнага, Індыйскага і Ціхага акіянаў з астравамі. Мяжа А. — паўн. размяшчэнне антарктычнага палярнага фронту, які праходзіць паміж 48° і 60° паўд. шыраты. Пл. каля 52,5 млн. км². Мацярык акружае шэльфавая паласа з глыбінямі да 500—600 м. Круты мацерыковы схіл на глыб. каля 3000 м зменьваецца шырокай паласой акіянскіх катлавін: Афрыканска-Антарктычнай, Аўстрала-Антарктычнай, Белінсгаўзена і Паўд.-Антыльскай з глыбінямі 5000—7000 м. Найглыбейшая частка — Паўд.-Сандвічаў жолаб (да

АНТАРКТЫДА



8428 м) з вял. сейсмічнасцю. На Пн ад катлавін Паўд.-Антыльскі і Афрыканска-Антарктычны хрыбты, Аўстрала-Антарктычнае і Паўд.-Ціхаакіянскае ўзвышша з тэктанічнымі разломамі і вулканічнымі масівамі. А. — найб. суровая вобласць Зямлі з нізкімі т-рамі паветра, снежнымі завірухамі, моцнымі вятрамі і туманамі. Мацярык — вобласць пастаяннага марозу. У субантарктычных раёнах сярэднія т-ры паветра самага цёплага месяца 10 °С, самага халоднага ад 0 да -10 °С. Ападкаў 300—500 мм каля ўзбярэжжа Усх. Антарктыды і да 1000 мм за год на паўн.-зах. узбярэжжы Антарктычнага п-ва і субантарктычных астравах. Т-ра антарктычных водаў ад -1,8 да 2 °С зімой і ад -1,2 да 3,5 °С летам. Салёнасць каля 34‰. На паўн. перыферыі А. магутнае антарктычнае цыркумпалярнае цячэнне (пераносіць ваду на У), у 60-х шыротах сістэма стацыянарных цыклanічных кругаабаротаў антарктычнага цячэння (пераносіць ваду на З, уздоўж узбярэжжа Антарктыды). Плошча, занятая марскімі льдамі, у канцы зімы 18—19 млн. км$^2$, летам 2—3 млн. км$^2$. Характэрны сталовыя айсбергі. Арганічны свет антарктычнай сушы вельмі бедны, у акіянах — багаты. На астравах тундравая расліннасць (імхі, лішайнікі, парасонавыя, некаторыя злакі і інш.). Шмат марскіх птушак — пінгвіны, буравеснікі, паморнікі, альбатросы, белы сявец, конік антарктычны і інш. У марской фауне кіты (фінвал, гарбач, сіні кіт, сейвал), ластаногія (марскі слон, марскі леапард, цюлені Уэдэла, Роса, крабаед, маржы), донныя арганізмы (ігласкурыя губкі, імшанкі і інш.). Рыбы сям. нататэніевых, ёсць анчоўсы, камбала і інш.

Міжнародны дагавор 1959 устанаўлівае, што тэр. А. — нейтральная і дэмілітарызаваная зона, якая выкарыстоўваецца ў мірных мэтах пры поўнай свабодзе навук. даследаванняў.

*Літ.*: Трешников А.Ф. Антарктика: исследования, открытия. Л., 1980; Слевич С.Б. Антарктика в современном мире. М., 1985.

**АНТАРКТЫ́ЧНАЕ ПАВЕ́ТРА**, антарктычныя паветраныя масы, палярныя паветраныя масы, якія фарміруюцца над Антарктыдай, водамі, што яе акружаюць, і льдамі акіяна. Падзяляецца на кантынентальнае А.п., якое доўга знаходзіцца над халодным мацерыком і набывае самыя нізкія на Зямлі т-ры, высокую празрыстаць і сухасць, характэрныя для *Антарктычнага антыцыклону*, і марское, што ўзнікае над акіянам, менш халоднае і нясе больш вільгаці. Уплывае на клімат паўд. частак Аўстраліі, Паўд. Амерыкі і Сусв. акіяна.

**АНТАРКТЫ́ЧНАЯ ПЛАТФО́РМА**, старажытная дакембрыйская тэктанічна стабільная структура зямной кары, якая займае ўсх. частку Антарктыды. Адносіцца да платформаў Гандванскай групы. На З абмежавана байкалідамі Трансантарктычных гор. Пл. каля 8 млн. км$^2$. Магутнасць зямной кары каля 40 км. Крышталічны фундамент мае архейскі ўзрост і складзены з пород гранулітавай і амфібалітавай фацый метамарфізму (эндэрбіты, чарнакіты, гнейсы, крышт. сланцы), якія прарваны

Айсберг у Антарктыцы.

інтрузіямі магматычных парод. Пароды фундамента выходзяць на падледавіковую паверхню ўздоўж узбярэжжа, адкуль паступова апускаюцца ў бок Трансантарктычных гор. Платформавы чахол пашыраны ў зах. частцы (магутнасць 3000—4000 м). Пераважаюць рыфейска-ніжнепалеазойскія вулканагенна-асадкавыя пароды (магутнасць да 2000 м), якія ўтвараюць дэпрэсіі на З і аўлакагены на У. Верхнепалеазойскія пароды на А.п. развіты спарадычна (кангламераты, пясчанікі, каменныя вугалі пермскага ўзросту, агульнай магутнасцю да 1300 м). Верхнюю частку чахла складаюць сярэдняюрскія базальты, магутнасць якіх дасягае 1500 м. *М.А.Нагорны.*

**АНТАРКТЫ́ЧНЫ АНТЫЦЫКЛО́Н**, вобласць высокага атм. ціску над Усх. Антарктыдай. Праяўляецца на працягу ўсяго года. Асабліва ўстойлівы зімой (чэрв.—жн.), калі ў час палярнай ночы мацярык моцна выхалоджваецца (т-ра ледавіковага покрыва апускаецца да -55 °С, паветра — да -89,3 °С). На перыферыі А.а. слабыя ўсх. вятры, якія ў зоне ледавіковага схілу ператвараюцца ў сцёкавыя і ўраганныя. Найб. ціск у цэнтры А.а. на плато Савецкае (4000 м над узр. м.). Пераважае бязвоблачнае, вельмі халоднае і сухое надвор'е. Назіраецца асяданне паветра ў працэсе кампенсацыі сцёку яго з мацерыка. На вышыні А.а. замяшчаецца каляпалярнай дэпрэсіяй — зонай нізкага ціску.

**АНТАРКТЫ́ЧНЫ КЛІ́МАТ**, клімат Антарктыды і прылеглых да яе акіянскіх прастораў (*Антарктыкі*). Над мацерыком надзвычай суровы. Т-ра паветра на працягу года адмоўная: летам у студз. да -13,6 °С, зімой у ліп. -60...-70 °С, на полюсе холаду (ст. Усход) самая нізкая на Зямлі — каля -90 °С. Ападкаў за год менш за 100 мм. Надвор'е вызначаецца *Антарктычным антыцыклонам*. Большая частка сонечнай радыяцыі адбіваецца снегавым покрывам (альбеда каля 85%), вял. страты цяпла даўгахвалевым выпрамяненнем з-за высокага становішча паверхні над узр. мора. На ўзбярэжжы т-ра паветра летам павышаецца да 0, +5 °С, гадавая сума ападкаў да 700—1000 мм, моцныя сцёкавыя і ўраганныя (40—60 м/с) вятры. Клімат акіянскіх прастораў Антарктыкі характарызуецца рэзкімі ваганнямі ціску, частымі цыклонамі, параўнальна аднароднымі т-рамі паветра.

**АНТАРКТЫ́ЧНЫ ПАЎВО́СТРАЎ** (да 1961 Зямля Грэяма), частка тэрыторыі *Антарктыды*, выцягнутая на Пн у напрамку Паўд. Амерыкі паміж морамі Уэдэла і Белінсгаўзена. Даўж. каля 1200 км, шыр. да 200 км. Выш. да 4191 м. Цэнтральная ч. — ледавіковае плато выш. 1500—2000 м; на ўзбярэжжах горныя масівы, месцамі свабодныя ад лёду. Клімат антарктычны (пад уплывам акіяна менш суровы, чым на мацерыку). На паўн.-зах. узбярэжжы зрэдку трапляюцца каля 10 відаў дробных травяністых кветкавых раслін. На А.п. антарктычныя навук. станцыі Вялікабрытаніі, Аргенціны, Чылі.

**АНТАРКТЫ́ЧНЫ ПО́ЯС**, самы паўднёвы геагр. пояс Зямлі. Уключае Антарктыду з прылеглымі астравамі і воды акіянаў, якія яе абмываюць. Займае 5% плошчы зямнога шара (амаль палавіна прыпадае на *антарктычных пустыняў зону*). Мяжу А.п. звычайна праводзяць па ізатэрме 5 °С, самага цёплага месяца (студз. ці лютага). Характарызуецца адмоўнымі ці нізкімі дадатнымі значэннямі радыяцыйнага балансу, панаваннем антарктычных паветраных масаў,

Кіты ў Антарктыцы.

*антарктычным кліматам*, доўгай палярнай ноччу, халоднымі паверхневымі водамі, пераважай на сушы ландшафтаў зоны арктычных пустыняў, значнай ледавітасцю акіяна. Гл. *Антарктыка*.

**АНТАРКТЫ́ЧНЫХ ПУСТЫ́НЯЎ ЗО́НА**, самая паўднёвая зона сушы ў межах *антарктычнага пояса*. Ахоплівае Антарктыду і сумежныя а-вы. Ландшафты А.п.з. фарміруюцца ва ўмовах пастаянна нізкіх т-р паветра і распаўсюджвання ледавіковага покрыва. Пераважаюць ледзяныя пустыні, у прыбярэжных раёнах у *антарктычных аазісах* і на астравах — камяністыя пустыні.

**АНТАРКТЫ́ЧНЫЯ АА́ЗІСЫ**, свабодныя ад ледавіковага покрыва ўчасткі краявой зоны Антарктыды. Плошча ад некалькіх дзесяткаў да соцень квадратных кіламетраў (аазіс Бангера 952 км$^2$). Размешчаны ўнутры вобласці ледавіковай акумуляцыі, акаймаваны зонай абляцыі. Для А.а. характэрны спецыфічны прыродны комплекс (мясцовы менш суровы клімат, ландшафты халодных пустыняў, шмат азёраў, арганічнае жыццё прымітыўнае, крыягенна-структурныя глебы). Раслінны свет: імхі, лішайнікі, прэснаводныя водарасці; жывёльны свет: птушкі — буравеснікі, паморнікі, у асобных А.а. — пінгвіны. У А.а. — большасць палярных навук. станцый.

**АНТА́РЫО** (Ontario), возера ў ЗША і Канадзе, ніжняе ў сістэме *Вялікіх азёраў* Паўн. Амерыкі. Пл. 19,5 тыс. км$^2$. Даўж. 311 км, шыр. да 90 км. Глыб. да 237 м. Пл. водазбору каля 90 тыс. км$^2$. Праз р. Ніягара прымае сцёк азёраў, што ляжаць вышэй; з возера выцякае р. Св. Лаўрэнція. А. — частка суднаходнага шляху, які злучае Атлантычны ак. з унутр. раёнамі ЗША і Канады. Суднаходныя каналы звязваюць А. з воз. Эры (канал Уэленд) і р. Гудзон (каналы Асуіга і Эры). Ледастаў са снеж. да красавіка. Пасля збудавання плаціны на р. Св. Лаўрэнція (1958) А. знаходзіцца ў падпоры. Буйныя парты: Таронта, Гамільтан, Кінгстан (Канада), Рочэстэр (ЗША). *Г.Я.Рылюк.*

**АНТА́РЫО** (Ontario), правінцыя на Пд Канады. Пл. 1068,6 тыс. км$^2$, нас. 10,085 млн. чал. (1991), каля 35% насельніцтва краіны. Адм. цэнтр — г. Таронта [635,4 тыс. чал., у агламерацыі Вял. Таронта 3,9 млн. чал. (1991)]; на тэр. А. знаходзіцца сталіца Канады г. Атава. Буйныя гарады: Гамільтан, Уінсар, Кітчэнер з Ватэрлоо, Лондан. Найб. урбанізаваная правінцыя, гар. насельніцтва каля 82%. На б. ч. тэр. Лаўрэнційскае ўзвышша (выш. да 646 м), на Пн — нізіны Гудзонава заліва, на Пд — ч. Цэнтральных раўнін. Клімат умераны, т-ра студз. ад -4 да -14 °С, ліп. 15—23 °С, ападкаў 370—1000 мм за год. Рачная сетка густая, на Пд Вял. азёры, на Пн Гудзонаў заліў. А. дае каля 50% прадукцыі апрацоўчай прам-сці краіны і каля 25% горназдабыўной. Асн. галіны прам-сці: чорная і каляровая металургія, аўтамабілебудаванне, нафтахім. і нафтаперапр., электратэхн., цэлюлозна-папяровая, харч. і харчасмакавая; расшыраецца прам-сць высокіх тэхналогій. Здабываюць нікель (1-е месца ў краіне), уран, жал. руды, цынк, медзь, золата, серабро і інш. А. — вядучая правінцыя па вытв-сці электраэнергіі: каля 35% даюць АЭС, 34% — ГЭС, 30% — ЦЭС. Інтэнсіўная сельская гаспадарка з малочнай жывёлагадоўляй, свінагадоўляй і агародніцтвам, вырошчваюць сою, кукурузу, тытунь, садавіну і вінаград. На Пд А. — самая густая ў краіне трансп. сетка, міжнар. аэрапорты. *З.М.Шуканава.*

**АНТА́РЭС**, α-Скарпіёна, пераменная зорка 0,8—1,2 візуальнай зорнай велічыні. Самая яркая ў сузор'і *Скарпіёна*, свяцільнасць у сярэднім у 5 тыс. разоў большая за сонечную. Адлегласць ад Сонца 125 пс.

Антацэрас кропкавы.

**АНТАСФЕ́РА** (ад грэч. anthos кветка + *сфера*), сфера ўплыву пахучых залоз асобнай кветкі на дзейнасць насякомых — апыляльнікаў раслін (спажыўцоў яе нектару і пылку). Тэрмін увёў сав. вучоны Я.М.Лаўрэнка (1959).

**АНТАФАГА́СТА** (Antofagasta), горад на Пн Чылі, адм. ц. вобласці Антафагаста. Засн. ў 1870. 219 тыс. ж. (1990). Порт на Ціхім ак. Чыг. вузел. Харч., хім. прам-сць, каляровая металургія; суднабудаванне. Цэнтр медзездабыўнога раёна. Рыбалоўства. Ун-т.

**АНТАФІЛІ́Т** (ад грэч. anthos колер + phyllon ліст), мінерал з групы рамбічных *амфіболаў* (Mg, Fe)$_7$[Si$_4$O$_{11}$]$_2$(OH)$_2$. Крышталі слупкаватыя, агрэгаты валакністыя. Колер шэры, зялёны, карычневы. Бляск шкляны. Цв. 5,5—6, Шчыльн. 2,85—3,2 г/см$^3$. Трапляецца ў крышталічных сланцах, серпенцінітах. Багатая жалезам валакністая разнавіднасць выкарыстоўваецца як гатунак азбесту.

**АНТАЦЫ́ДНЫЯ СРО́ДКІ**, лекавыя рэчывы, здольныя звязваць і нейтралізаваць саляную к-ту, што знаходзіцца ў страўнікавым соку. Выкарыстоўваюцца пры гастрытах, язвавай хваробе з высокай кіслотнасцю. А.с. могуць быць солі, вокіслы і гідравокіслы шчолачных і шчолачна-зямельных металаў, якія ў залежнасці ад усмоктвання ў страўніку падзяляюцца на 2 групы. Рэзарбцыйныя А.с. (натрыю гідракарбанат, калію і кальцыю карбанаты) знімаюць пякотку і боль, але пры ўзаемадзеянні з салянай к-той утвараюць вуглякіслы газ, што прыводзіць да расцягвання страўніка і адрыжкі. Нерэзарбцыйныя А.с. (магнію вокіс і карбанат, алюмінію гідравокіс і фасфат) утвараюць з салянай к-той хларыды, якія нейтралізуюць павышаную кіслотнасць і садзейнічаюць утварэнню геляў у водным асяроддзі страўніка. Выкарыстоўваюцца камбінаваныя А.с., што ўключаюць вяжучыя, спазмалітычныя, жаўцягонныя, слабіцельныя і анестэзоўныя сродкі (вікаір, вікалін, альмагель).

**АНТАЦЫЯ́НЫ** (ад грэч. anthos колер + kyanos блакітны), фарбавальныя рэчывы (пігменты з групы *флаваноідаў*) клетачнага соку раслін. Паводле хім. саставу — гліказіды, у якіх рэшткі глюкозы або інш. цукру звязаны з афарбаваным нецукрыстым рэчывам. Колер А. залежыць ад хім. прыроды апошняга і рэакцыі асяроддзя (напр., чырвоны — у кіслым, сіні, фіялетавы — у шчолачным). Наяўнасцю А. абумоўлена фіялетавая, сіняя, карычневая, чырв., аранжавая і інш. афарбоўка пялёсткаў кветак, пладоў, лістоў, сцяблоў, чырв. колер вінаў і фруктовых сокаў. Мяркуюць, што А. — ахоўны сродак ад шкоднага дзеяння ультрафіялетавых прамянёў і перагрэву тканак.

**АНТАЦЭ́РАС** (Anthoceros), род антацэротавых імхоў сям. антацэротавых. Каля 150 відаў. Пашыраны пераважна ў тропіках, некаторыя ва ўмераных шыротах. На Беларусі на аблогах, каля дарог, па канавах, берагах рэк трапляецца А. кропкавы (A. punctatus).

Слаявіна цёмна-зялёная, разеткападобная, дыям. 2—5 см, шчыльна прылягае да субстрату, з рассечанымі лопасцепадобнымі вырастамі, унізе з слізевымі поласцямі, якія пазней запаўняюцца калоніямі водарасцяў з роду насток. Прымацоўваецца да субстрату аднаклетачнымі *рызоідамі*. Спарагон цыліндрычны, з калонкай і стэрыльнымі ніткамі (элатэрамі), якія служаць для разрыхлення спораў, прамастойны, даўж. 1—10 см, зялёны, потым бурэе і раскрываецца на 2 створкі. Споры тэтраэдрычныя, цёмныя, з шчытападобнымі вырастамі. Спараносіць летам і ўвосень. *Г.Ф.Рыкоўскі.*

**АНТАЦЭРО́ТАВЫЯ ІМХІ́**, антацэратопсіды (Athocerotopsida), клас мохападобных. Уключае 2 сям. — антацэротавыя (4 роды) і натациласавыя (1 род). Каля 300 відаў. Пашыраны ў трапічных і ва ўмерана цёплых краінах. Першапасяленцы вільготных аголеных глебаў; у тропіках растуць на галінках,

лісці і адмерлых раслінах. На Беларусі адзінае сям. антацэротавых з 2 родамі — *антацэрас* і феацэрас.

Стараж. група імхоў, якія, магчыма, існуюць з верхняга палеазою. Спалучае асобныя прыкметы пячоначнікаў, імхоў, сасудзістых раслін і водарасцяў. Лічыцца прамежкавым звяном паміж астатнімі мохападобнымі і сасудзістымі раслінамі. Прыкметы: неабмежаваны рост спарафіта, наяўнасць пласціністых



А.К.Антонаў.

храматафораў з пірэноідам і тыповых для вышэйшых раслін вусцейкаў у гаметафіта.

*Літ.*: Жизнь растений. Т. 4. Мхи. Плауны. Хвощи. Папоротники. Голосеменные растения. М., 1978; Водоросли, лишайники и мохообразные СССР. М., 1978. *Г.Ф.Рыкоўскі.*

**АНТАШКЕ́ВІЧ** Фёдар Кузьміч (1922, в. Казігорка Талачынскага р-на Віцебскай вобл. — 4.3.1945), Герой Сав. Саюза (1945). У Вял. Айч. вайну на фронце з кастр. 1941. Камандзір гарматы ст. сяржант А. вызначыўся ў баях за г. Губен (Германія): разлік гарматы А. адбіў 8 варожых контратак. Загінуў у баі.

**АНТАШЭ́ЎСКІ** Антон, бел. жывапісец 18 ст. Лічыцца аўтарам фрэсак у Мінскім кафедральным касцёле (канец 18 ст.; пазней адноўлены Валасевічам, у сярэдзіне 19 ст. — Таргонскім).

**АНТВЕ́РПЕН**, Антвер (флам. Antwerpen, франц. Anvers), горад у Бельгіі. Адм. ц. аднайменнай правінцыі. Другі па велічыні пасля Бруселя горад краіны; 467,8 тыс. ж. (з прыгарадамі больш за 700 тыс. ж., 1992). Размяшчаецца за 88 км ад Паўночнага м. на р. Шэльда, даступнай для марскіх суднаў, і Альберта-канале. Тунэлі пад ракой злучаюць часткі горада. Буйнейшы ў Еўропе гандл.-фінансавы цэнтр. Гал. кірункі эканомікі — знешнегандл. і фін. аперацыі, міжнар. транзітныя перавозкі. А. — трэці пасля Ротэрдама і Марселя марскі порт Еўропы (грузааварот за год больш за 90 млн. т). Вузел перасячэння чыгунак, аўтадарог, нафта- і прадуктаправодаў. Гал. прамысл. горад краіны. Прам-сць звязана з абслугоўваннем партовай гаспадаркі і апрацоўкай прывазной сыравіны, асабліва нафты (магутнасць нафтаперапр. з-даў да 36 млн. т за год). Развіты машынабудаванне, трактара- і аўтазборка, радыёэлектроніка і інш., каляровая металургія, хім., тэкст., вытв-сць алмазнага інструменту. АЭС. А. — найбуйнейшы ў свеце цэнтр агранкі алмазаў і гандлю брыльянтамі. Антверпенская алмазная біржа мае ў абароце каля 70% апрацаваных алмазаў свету.

Упершыню ўпамінаецца ў 7 ст. З 1291 го-

Антверпен. Від на сабор Онзе-ліве-Браўэкерк. 1352—1616.

рад. З 1315 у Ганзейскім саюзе гарадоў. З 16 ст. буйны гандл. і фін. цэнтр Зах. Еўропы. У 1579 далучыўся да *Утрэхцкай уніі*. У 1585 захоплены іспанцамі, у 1794 — французамі. Паступова страціў эканам. значэнне. З 1814 у складзе Нідэрландаў, з 1830 — гандл. порт Бельгіі.

Гіст. ядро А. на правым беразе р. Шэльда: познагатычныя збудаванні з багатым дэкорам (сабор Онзе-ліве-Браўэкерк, 1352—1616; замак Стэн, перабудаваны ў 1520—21, шматлікія дамы і цэрквы ў стылях готыкі і барока). На пл. Гротэ-маркт помнікі фламандскага рэнесансу: ратуша (1561—65, арх. К.Флорыс), дамы гільдый, Дом П.П.Рубенса (1611—18), каралеўскі палац (1743—45) — усе ў стылі барока. На месцы гар. сцен 16 ст. паўкальцо бульвараў, за іх мяжой — новыя жылыя раёны з эклектычнымі забудовамі ў стылях мадэрн і функцыяналізму.

*Літ.*: Герман М. Антверпен. Гент. Брюгге: Города старой Фландрии. Л., 1974.

*Ф.С.Фешчанка* (гаспадарка).

Антверпен. «Вялікі рынак» з будынкамі гільдый (16 ст.).

**АНТВО́ЗЕРА**, возера ў Беларусі, у Гродзенскім р-не, у бас. р. Пыранка. За 23 км на ПдУ ад г. Гродна. Пл. 0,55 км². Даўж. 1,7 км, найб. шыр. 0,4 км. Даўж. берагавой лініі 3,9 км. Схілы выш. 5—12 м, параслыя лесам. Берагі зліваюцца са схіламі. Праз А. цячэ р. Сламянка і злучае яго з воз. Зацкава.

**АНТО́НАВА**, вёска ў Беларусі, у Валынецкім с/с Верхнядзвінскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса. За 25 км на У ад Верхнядзвінска, 156 км ад Віцебска, 1,5 км ад чыг. раз'езда Беніслаўскага. 458 ж., 167 двароў (1995). Дапаможная школа, б-ка, Дом культуры, аддз. сувязі.

**АНТО́НАВА** Валянціна Васілеўна (н. 2.10.1932, Мінск), бел. спявачка. Засл. арт. Беларусі (1966). З 1952 салістка Дзярж. нар. хору БССР (падгалосачнае сапрана), створаных пры хоры актэта і квартэта *«Купалінка»*. У 1975—80 у фальклорна-харэагр. ансамблі *«Харошкі»*.

**АНТО́НАВА ПАЎСТА́ННЕ**, узброенае выступленне сялян Тамбоўскай і часткова Варонежскай губ. у Расіі ў 1920—21. Асн. прычына — незадаволенасць палітыкай *«ваеннага камунізму»*, прымусовай працай, харчразвёрсткай. Кіраўнік паўстання — эсэр А.С.Антонаў, б. нач. міліцыі Кірсанаўскага пав. Тамбоўскай губ. Пасля прыходу да ўлады бальшавікоў стаў на шлях тэрору, хаваўся ў лясах, завочна прыгавораны да расстрэлу. 19.8.1920 у с. Каменка Кірсанаўскага пав. пачалося стыхійнае сял. выступленне, якое хутка пашырылася на тэр. суседніх паветаў. За некалькі месяцаў Антонаў сабраў рассеяныя сял. групы (каля 500 чал.) і сфарміраваў атрад. У 2-й пал. 1920 сфарміраваны кіруючыя органы руху — гал. аператыўны штаб партыз. арміі Тамбоўскага краю, складзены праграма і статут тамбоўскага «Саюза працоўнага сялянства» (СПС), арганізаваны к-ты СПС у паветах, валасцях і вёсках. СПС выступаў за «звяржэнне ўлады камуністаў-бальшавікоў», за ліквідацыю падзелу ўладамі грамадзян на класы, спыненне грамадз. вайны, скліканне Устаноўчага сходу, грамадз. свабоды,

правядзенне ў жыццё закону аб сацыялізацыі зямлі, частковую дэнацыяналізацыю фабрык і з-даў, развіццё канцэсій, свабодны гандаль, устанаўленне рабочага кантролю над вытв-сцю і размеркаваннем прадукцыі і інш. Да канца 1921 2 арміі Антонава аб'ядноўвалі 14 тэр. палкоў, 5 асобных кав. палкоў, атрады самаабароны ў сёлах агульнай колькасцю некалькі дзесяткаў тысяч чалавек, з іх каля 8—10 тыс. узброеных. У студз. 1921 для ліквідацыі паўстання была створана спец. камісія на чале з У.А.Антонавым-Аўсеенкам. У лют. 1921 пасля няўдалых спробаў задушыць паўстанне сілай улады пайшлі на частковыя ўступкі, гал. з якіх была датэрміновая адмена харчразвёрсткі ў Тамбоўскай губ. Аднак к-ты СПС скіроўвалі паўстанцаў на працяг барацьбы са сваім паліт. праціўнікам. Больш як 50-тысячная армія пад камандаваннем М.М.Тухачэўскага, узмоцненая атрадамі спец. войскаў ВЧК, з артыл. гарматамі, браневікамі, самалётамі, да восені 1921 задушыла паўстанне. Антонаў загінуў у перастрэлцы летам 1922. Нягледзячы на паражэнне, А.п. стала адным з фактараў, што прымусілі ўлады адмовіцца ад ваенна-камуніст. метадаў пабудовы сацыялізму і перайсці да *новай эканамічнай палітыкі.*

*Літ.*: Фельдман Д. Крестьянская война // Родина. 1989. № 10. *В.І.Мянькоўскі.*

**АНТО́НАЎ** Алег Канстанцінавіч (7.2.1906, с. Троіцкае Падольскага р-на Маскоўскай вобл. — 4.4.1984), савецкі авіяканструктар і вучоны ў галіне самалётабудавання. Акад. АН СССР (1981), АН Украіны (1968). Герой Сац. Працы (1966). Скончыў Ленінградскі політэхн. ін-т (1930). Працаваў на Маскоўскім планёрным з-дзе, з 1938 у КБ А.С.Якаўлева, у 1946 узначаліў самалётабуд. КБ. Стварыў каля 40 канструкцый планёраў і самалётаў, у т.л. Ан-2 (1947), Ан-8 (1955), самалёты з турбавінтавымі рухавікамі: пасажырскія Ан-10, Ан-24, трансп. Ан-12, Ан-14 і інш. У 1964 створаны шырокафюзеляжны Ан-22 (*«Антэй»*), у 1980-я г. — пасажырскі Ан-28, трансп. скарочанага ўзлёту і пасадкі Ан-72, трансп. Ан-124 (*«Руслан»*). Дзярж. прэмія СССР 1952, Ленінская прэмія 1962.

*Тв.*: На крыльях из дерева и полотна. М., 1962; Десять раз сначала: Рассказы. Киев, 1981.

*Літ.*: Казаков В. Сотвори себя. Саратов, 1986; Пономарев А.Н. Советские авиационные конструкторы. 3 изд. М., 1990.

**АНТО́НАЎ** Аляксей Інакенцьевіч (27.9.1896, г. Гродна — 18.6.1962), ваенны дзеяч. Ген. арміі (1943). Скончыў ваен. акадэміі імя Фрунзе (1931) і Генштаба (1937). У арміі з 1916, у Чырв. Арміі з 1919. Удзельнік 1-й сусв. і грамадз. войнаў. З 1938 на выкладчыцкай рабоце. У Вял. Айч. вайну са жн. 1941 нач. штаба Паўд., Паўн.-Каўказскага і Закаўказскага франтоў, Чарнаморскай групы войскаў. З 1942 1-ы нам. нач. Генштаба і нач. Аператыўнага ўпраўлення, удзельнік распрацоўкі плана *Берлінскай аперацыі 1944*, інш. важных аперацый. З лют. 1945 нач. Генштаба, удзельнік Крымскай і Берлінскай (Патсдамскай) канферэнцый. У 1946—48 і з 1954 1-ы нам. нач. Генштаба, з 1955 адначасова нач. Штаба Аб'яднаных узбр. сіл дзяржаў — удзельніц Варшаўскага Дагавора. Дэп. ВС СССР з 1946.

**АНТО́НАЎ** Ігнат Пятровіч (н. 28.12.1922, в. Будніца Віцебскага р-на), бел. неўрапатолаг. Акад. АН Беларусі (1984), чл.-кар. АМН СССР (1974). Д-р мед. н. (1966), праф. (1967). Засл. дз. нав. Беларусі (1972). Нар. ўрач Беларусі (1992). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1950). З 1962 дырэктар Бел. НДІ неўралогіі і фізіятэрапіі. Працы па вывучэнні інфекц., сасудзістых і паразітарных хвароб нерв. сістэмы, фізіятэрапіі і курарталогіі.

*Тв.*: Ангиографическая диагностика сосудистых поражений и опухолей головного мозга. Мн., 1973 (у сааўт.); Гиперкинезы у детей. Мн,, 1975 (разам з Г.Г.Шанько); Вертебрально-базилярные инсульты. Мн., 1977 (разам з Л.С.Гіткінай).

Антонаўка звычайная.

**АНТО́НАЎ** (Антонов) Нікалай Іарданаў (н. 23.5.1926, в. Эмен Велікатырнаўскай акр., Балгарыя), балгарскі пісьменнік, перакладчык. Скончыў Сафійскі вышэйшы мед. ін-т (1950). Вершы, паэмы, апавяданні, аповесці ў зб-ках «Былыя людзі» (1951), «Батальён» (1957), «У адкрытым моры» (1965), «Айчына» (1975) прысвечаны антыфаш. барацьбе і сучаснасці. У анталогіі «Паэзія перамогі» (1955), складзенай А., змешчаны яго пераклады твораў Я.Купалы, Я.Коласа, П.Броўкі, П.Глебкі, М.Танка, А.Куляшова, П.Панчанкі, П.Пестрака, М.Засіма.

*Тв.*: Бел. пер. — Размова з чужаземцам наконт пуцевадзіцеля // Сто гадоў, сто паэтаў, сто песень, 1878—1978. Мн., 1978.

**АНТО́НАЎ** Міхаіл Майсеевіч (11.3.1923, г.п. Краснаполле Магілёўскай вобл. — 4.8.1943), Герой Сав. Саюза (1943). Скончыў танк. вучылішча (1941). У Вял. Айч. вайну з ліп. 1941 на фронце. Камандзір танк. ўзвода ст. лейтэнант А. вызначыўся ў ліп.—жн. 1943 пры вызваленні г. Арла: танкісты яго ўзвода 7 разоў атакавалі ворага на падыходзе да горада, першыя ўварваліся ў яго. Загінуў у баі.

А.І.Антонаў.

І.П.Антонаў.

**АНТО́НАЎ** Сяргей Пятровіч (н. 3.5.1915, С.-Пецярбург), рускі пісьменнік. Скончыў Ленінградскі аўтадарожны ін-т (1938). Аўтар зб-каў апавяданняў і нарысаў «На дарогах ідуць машыны» (1950, Дзярж. прэмія СССР 1951), «Мірныя людзі» (1950), аповесцяў «Зялёны дол» (1953—54), «Парожні рэйс» (1960), «Разарваны рубель» (1966), «Царская саракоўка» (1969), кніг «Лісты пра апавяданне» (1964), «Ад першай асобы. Апавяданні пра пісьменнікаў, кнігі і словы» (1973) і інш., прысвечаных сціплым людзям-працаўнікам, адметныя маральнай праблематыкай, лірызмам. Па аповесцях А. «Паддубенскія прыпеўкі» (1950), «Справа была ў Пянькове» (1956), «Алёнка» (1960) пастаўлены маст. фільмы.

*Тв.*: Собр. соч. Т. 1—3. М., 1983—84.

*С.Н.Чубакоў.*

**АНТО́НАЎ** Юрый Міхайлавіч (н. 19.2.1945, г. Ташкент), спявак і кампазітар. Засл. дз. маст. Расіі (1994). Скончыў Маладзечанскае муз. вучылішча (1963, клас акардэона). Працаваў у калектывах эстраднага жанру, у т.л. ў ансамблі пад кіраўніцтвам В.Вуячыча, аркестры «Сучаснік», вак.-інстр. ансамблях «Пявучыя гітары», «Магістраль» (арганізатар), «Аракс» і інш. Аўтар і выканаўца папулярных песень (у т.л. «Залатая лесвіца», «Макі», «Снегіры», «Ля бяроз і сосен» і інш.).

*Дз.А.Падбярэзскі.*

**АНТО́НАЎ-АЎСЕ́ЕНКА** Уладзімір Аляксандравіч (21.3.1883, г. Чарнігаў — 1938), савецкі ваенны, парт. і дзярж. дзеяч, дыпламат. Скончыў Пецярбургскае ваенна-інжынернае вучылішча (1904). За рэв. дзейнасць асуджаны на

20 гадоў катаргі. У 1910—17 у эмігрыцыі (Францыя). У кастр. 1917 сакратар Петраградскага ВРК, адзін з кіраўнікоў захопу Зімняга палаца і арышту Часовага ўрада. У грамадз. вайну галоўнакамандуючы Укр. фронтам. У 1922—24 нач. Палітупраўлення РВС рэспублікі. У 1924—33 паўпрэд СССР у Чэхаславакіі, Літве і Польшчы, з 1934 пракурор

Марк Антоній. Скульптура. 1 ст. да н.э.

РСФСР, у 1936—37 ген. консул СССР у Барселоне (Іспанія), з 1937 нарком юстыцыі РСФСР. Рэпрэсіраваны, рэабілітаваны пасмяротна.

**АНТО́НАЎКА** звычайная, старадаўні рускі зімовы сорт яблыні нар. селекцыі. Пашыраны ў многіх абласцях Расіі, на Украіне, у Прыбалтыцы, Казахстане, Кыргызстане, а таксама ў Польшчы. На Беларусі раянаваны ва ўсіх зонах.

Дрэвы выш. 6—8 м, крона паўшарападобная. Плады масаю 80—140 г, розныя па форме, жаўтавата-зялёныя. Мякаць белая, сакаўная, вінна-салодкая з характэрным моцным пахам. Дрэвы зімаўстойлівыя, жывуць да 60—70 гадоў, непатрабавальныя да глебы. Пладаносяць на 6—7-ы год пасля пасадкі. Плады выспяваюць у канцы верасня. А. ўстойлівая да хвароб, у дажджлівыя гады пашкоджваецца паршой. У культуры вядомы таксама А. камянічка, А. шасцісоттрамовая і інш. (адрозніваюцца асобнымі марфалагічнымі прыкметамі, лёжкасцю пладоў і смакам).

**АНТО́НАЎКА**, вёска ў Беларусі, у Чавускім р-не Магілёўскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «1 Мая». За 9 км на ПдЗ ад г. Чавусы, 50 км ад Магілёва, 5 км ад чыг. станцыі Чавусы. 520 ж., 152 двары (1995). Сярэдняя школа, б-ка, Дом культуры, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

**АНТО́НЕНКА** Аляксей Касьянавіч (10.2.1911, в. Васькавічы Віцебскага р-на — 25.7.1941, пахаваны ў в. Хатка, Фінляндыя), Герой Сав. Саюза (1941). У Чырв. Арміі з 1929. Скончыў Ейскую школу марскіх лётчыкаў (1932). Удзельнік баёў на р. Халхін-Гол у 1939, сав.-фінл. вайны 1939—40. У Вял. Айч. вайну з 1941 на Ленінградскім фронце. Лётчык-знішчальнік капітан А. збіў 11 самалётаў ворага. Загінуў у баі.

**АНТО́НІЙ** Марк (Marcus Antonius; каля 82—30 да н.э.), рымскі паліт. дзеяч і палкаводзец, прыхільнік *Цэзара*. Нар. трыбун у 49, консул у 44. Пасля забойства Цэзара і паражэння ў грамадз. вайне ў 43 заключыў саюз з Актавіянам і Лепідам, т.зв. 2-і трыумвірат, для барацьбы супраць Брута і Касія — забойцаў Цэзара. У 42 кіраваў усх. правінцыямі. Шлюб з Клеапатрай і сварка з Актавіянам прывялі да аднаўлення грамадз. вайны. У баі каля Акцыя 2.9.31 аб'яднаны флот А. і Клеапатры разбіты. А. адступіў у Егіпет і скончыў самагубствам.

**АНТО́НІМЫ** (ад *анты...* + грэч. ...onyma імя), словы адной і той жа часціны мовы з процілеглым значэннем. Гл. ў арт. *Антанімія*.

**АНТО́НІЧ** Багдан-Ігар (5.10.1909, с. Навіца на Лемкаўшчыне, Польшча — 6.7.1937), украінскі паэт. Скончыў Львоўскі ун-т (1933). Лірыка А. (зб-кі «Вітанне жыцця», 1931; «Тры пярсцёнкі», 1934; «Кніга Льва», 1936; «Зялёнае Евангелле» і «Ратацыі», 1938) адметная філасафічнасцю, своеасаблівым касмічна-планетарным светаўспрыманнем, манументальнай вобразнасцю, арыгінальнай метрыкай і метафарычнасцю. Узаемаадносіны чалавека і прыроды, сутнасць жыцця — лейтматыў яго паэзіі. Аўтар лібрэта оперы «Доўбуш», незакончанага рамана «На тым беразе», артыкулаў па эстэтыцы.

*Тв.*: Пісня про незнищенність матерії. Київ, 1967.

*Літ.*: Богдан-Ігор Антонич // Історія української літератури XX століття. Київ, 1994. Кн. 1. *В.А.Чабаненка.*

**АНТО́ПАЛЬ**, гарадскі пасёлак на Беларусі, цэнтр Антопальскага пасялковага Савета Драгічынскага р-на Брэсцкай вобл. За 28 км на З ад Драгічына. На аўтадарозе Кобрын—Драгічын, чыг. ст. Антопаль на лініі Брэст—Пінск. 2,4 тыс. ж. (1995).

Вядомы з 16 ст. ў складзе Берасцейскага ваяв. ВКЛ. 2.3.1731 кароль Аўгуст III надаў А. прывілей на 3 штогадовыя кірмашы. З 1795 мястэчка Кобрынскага пав. Слонімскай, з 1797 Літоўскай, з 1801 Гродзенскай губ. У 1897 было 3867 жыхароў, 1262 дамы, нар. вучылішча. Напярэдадні 1-й сусв. вайны працавалі сукнавальня, смалакурня, 2 маслабойні, 6 мукамольняў. У 1915 акупіраваны кайзераўскімі, у 1919 — польскімі войскамі. З 1921 у складзе Польшчы. З 1939 у БССР, з 15.1.1940 гар. пасёлак. У 1940—59 цэнтр Антопальскага р-на. З 25.6.1941 да 16.7.1944 акупіраваны ням. фашыстамі. З 1959 у Драгічынскім р-не.

Ватнапрадзільная ф-ка, камбінат быт. абслугоўвання, сярэдняя і муз. школы, школа-інтэрнат, вучэбна-вытв. камбінат, Дом культуры, кінатэатр, 2 б-кі, бальніца, паліклініка, аптэка, аддз. сувязі, Васкрасенская царква і касцёл (помнікі архітэктуры 19 ст.).

**АНТО́ПАЛЬСКІ РАЁН**. Існаваў у 1940—59 у Брэсцкай вобл. Утвораны 15.1.1940. Цэнтр — г.п. *Антопаль*. Пл. 900 км², 85 нас. пунктаў. Падзяляўся на 13 сельсаветаў. Скасаваны 8.8.1959.

**АНТРАКНО́ЗЫ** [ад грэч. anthrax (anthrakos) вугаль, карбункул + ...*оз*(ы)], хваробы раслін, якія выклікаюцца паразітнымі грыбамі з родаў глеяспорый, калетотрых і кабатыела. Найб. пашыраны ў зоне ўмеранага клімату, асабліва значна зніжаюць ураджай у вільготныя і цёплыя гады. Хварэюць на А. гарбузовыя, бабовыя, цытрусавыя, вінаград, грэцкі арэх, жэньшэнь і інш. На Беларусі А. найбольш шкодзіць лёну, бабовым культурам, агуркам, памідорам, чорным парэчкам і агрэсту.

На карэньчыках праросткаў і надземных ч. расліны ўтвараюцца язвачкі або плямы рознага колеру з цёмнымі, рэзка абмежаванымі краямі. Інфекцыя перадаецца з насеннем, праз глебу (з раслінными рэшткамі), можа разносіцца вадой, насякомымі, ветрам. Меры барацьбы: дэзінфекцыя, апырскванне фунгіцыдамі, зяблевае ворыва, унясенне ўгнаенняў.

**АНТРАКО́З** лёгкіх, хранічная прафесійная хвароба пераважна шахцёраў, якая выклікаецца паступовым назапашваннем у лёгкіх каменнавугальнага пылу і суправаджаецца развіццём фібрознага працэсу; від *пнеўмаканіёзу*.

**АНТРА́КТ** (франц. entracte), 1) перапынак паміж актамі (дзеямі) спектакля ці аддзяленнямі канцэрта, цыркавога паказу. 2) Музычная п'еса, якая з'яўляецца ўступам да акта (акрамя 1-га) ці карціны оперная, балетнага або драм. спектакля. Выконваецца пасля перапынку, перад тым як падняць заслону.

**АНТРАПА...** (ад грэч. anthrōpos чалавек), першая састаўная частка складаных слоў, якая абазначае: «які адносіцца да чалавека», напр. *антрапалогія, антрапагенетыка*.

**АНТРАПАБІЯЦЭНО́З** (ад *антрапа...* + *біяцэноз*), біяцэноз, які знаходзіцца пад настаянным уплывам гасп. дзейнасці чалавека.

**АНТРАПАГЕ́НАВАЯ СІСТЭ́МА (ПЕРЫЯД)**, антрапаген (ад *антрапа...* + грэч. genos нараджэнне), чацвярцічная сістэма (перыяд), апошняя сістэма *кайназойскай эратэмы (групы)* і апошні перыяд геал. гісторыі Зямлі, які доўжыцца і цяпер. Назву даў у 1922 рускі геолаг А.П.Паўлаў па найважнейшай падзеі — станаўленні чалавека. Ніжняя ўзроставая мяжа 1,65 млн. гадоў (некаторыя даследчыкі лічаць 2,4—3 млн. гадоў). Традыцыйна падзяляецца на *галацэн* (0—10 тыс. гадоў назад), *плейстацэн* (10—800 тыс. гадоў назад) і *эаплейстацэн* (800—1650 тыс. гадоў назад). Антрапаген вывучае чацвярцічная геалогія, адзін з цэнтраў развіцця якой на Беларусі.

**Агульная характарыстыка**. Адклады антрапагену ўтварыліся ў выніку дзеяння спецыфічных для канца кайназою прыродных працэсаў, сярод якіх найважнейшыя — глабальнае пахаладанне

клімату, інтэнсіўныя тэктанічныя рухі і вулканізм, мацерыковыя *зледзяненні* і звязаныя з імі ваганні ўзроўню акіяна. Тэктанічныя рухі зямной кары ў поясе альпійскай складкавасці і пахаладанне клімату прывялі да павелічэння *крыясферы* і ўзнікнення зледзянення на мацерыках Паўн. паўшар'я. Ледавіковыя покрывы ахапілі да 45 млн. км$^2$ сушы, што ў 3 разы перавышала сучаснае зледзяненне. Паўд. мяжа макс. пашырэння лёду дасягала ў Еўропе 48°30' паўн. ш., у Паўн. Амерыцы — 37°30' паўн. ш. Даследчыкі вылучаюць ад 3 да 9 зледзяненняў, якія чаргаваліся з *міжледавікоўямі*. На тэр. Беларусі праходзяць межы большасці вял. ледавіковых покрываў. У час зледзяненняў вял. масы вады акумуляваліся ў ледавіковых шчытах, што выклікала зніжэнне ўзроўню акіяна на 100 м і больш і злучэнне мацерыкоў Паўн. паўшар'я па Берынгавым мосце. Узровень акіяна і клімат міжледавіковых часоў нагадваў сучасны. У субтрапічных шыротах зледзяненням адпавядалі вільготныя перыяды (плювіялы), міжледавікоўям — больш сухія.

**Адклады** антрапагену пераважна кантынентальныя, сярод іх найб. пашыраны ледавіковыя (марэнныя, канцова-марэнныя, водна-ледавіковыя і лёсавыя) і такія генетычныя тыпы, як алювій, перлювій, калювій, азёрныя, балотныя, эолавыя. На прыморскіх раўнінах і шэльфе намнажаліся ледавікова-марскія і марскія адклады. У тоўшчы антрапагену на Беларусі на ледавіковыя адклады прыпадае да 88%. Пяскі складаюць 39%, гліны — 4, буйнаабломкавыя пароды — 4, марэны — 8, лёсападобныя — 0,5, карбанатныя — 1, інш. — 3,5%. Магутнасць кантынентальных адкладаў да 300 м, сярэдняя на Беларусі — 80 м, макс. — 324,5 м (у Лагойскай астраблеме). На адкладах антрапагену ўтварыўся сучасны рэльеф раўнін і нізін Зямлі, яны з'яўляюцца субстратам для глебаў, аб'ектам горных, інж.-геал. работ і *антрапагеннага ўздзеяння* на прыроду.

**Станаўленне чалавека** супадае з антрапагенавым перыядам: пітэкантрап з'явіўся ва Усх. Афрыцы каля 1,6 млн. гадоў назад. У канцы плейстацэну людзі рассяляліся паблізу ледавіка, дзе жылі буйныя жывёлы (у прыватнасці, маманты), паляванне на якіх было асновай існавання познепалеалітычнага чалавека. Мяркуюць, што на тэр. Беларусі чалавек з'явіўся каля 100 тыс. гадоў назад (вядомыя стаянкі першабытных людзей *Бердыж* і *Юравічы* маюць узрост 26—24 тыс. гадоў).

**Карысныя выкапні.** У адкладах антрапагену вядомы радовішчы золата, алмазаў, баксітаў, нікелю, буд. матэрыялаў (гліна, суглінак, пясок, жвір, галечнік, валуны, вапняк), торфу, сапрапеляў, прыроднага газу, дыятамітаў, солі, лячэбных гразяў, серы, марганцу, прэснай пітной вады. На Беларусі з гэтых адкладаў здабываюць буд. матэрыялы, торф, сапрапелі, лячэбныя гразі, пітную ваду, россыпнае золата.

**Стратыграфічны падзел.** У пач. 20 ст. аўстрыйскія вучоныя А.Пенк і Э.Брыкнер распрацавалі ледавіковую стратыграфію для Альпаў, у якіх вылучылі 4 зледзяненні — гюнцкае, міндэльскае, рыскае і вюрмскае, пазней дунайскае (самае старажытнае). Найчасцей А.с.(п.) падзяляюць на 4 звяны (адпавядаюць пададдзелу) — ніжняе, сярэдняе, верхняе і сучаснае. У рэгіянальных стратыграфічных шкалах асн. адзінка расчляянення — гарызонт, які адпавядае палавіне кліматычнага рытму — пахаладанню (зледзяненню) або пацяпленню (міжледавікоўю). У схеме чацвярцічных (антрапагенавых) адкладаў Беларусі вылучаны (1981) брэсцкі перадледавіковы, нараўскі, бярэзінскі, дняпроўскі, сожскі, паазерскі ледавіковыя і белавежскі, александрыйскі, шклоўскі, муравінскі і галацэнавы міжледавіковыя гарызонты. Многія бел. даследчыкі з белавежскага гарызонта вылучаюць карчоўскі міжледавіковы, атаясамліваюць белавежскі і шклоўскі міжледавіковыя гарызонты, аб'ядноўваюць дняпроўскі і сожскі ледавіковыя гарызонты і вылучаюць эаплейстацэн і інш. падраздзяленні. У Зах. Еўропе найб. пашырана школа, распрацаваная В.Загвійнам (1989) для Нідэрландаў, у Расіі — І.І.Красновым і А.П.Зарынай (1987), С.М.Шыкам (1992), на Беларусі — схемы Б.М.Гурскага з сааўтарамі (1981) і Л.М.Вазнечука (1981).

*Літ.*: Материалы по стратиграфии Белоруссии. Мн., 1981; Стратиграфия СССР: Четвертич. система. Полутома 1—2. М., 1982—84; Zagwijn W.H. The Netherlands during the Tertiary and the Quaternary: A case history of Coastal Lowland evolution // Geologie en Mijnbouw. 1989. Vol. 68, Nr. 1.

*Э.А.Ляўкоў, М.Я.Зусь.*

**АНТРАПАГЕНЕ́З** (ад *антрàпа...* + *...генез*), 1) станаўленне чалавека як біял. віду ў працэсе фарміравання супольнасці — сацыягенезу. 2) Раздзел *антрапалогіі*, які вывучае гэту з'яву. Тэорыя А. дае адказы на пытанні, дзе і пры якіх абставінах з'явіўся чалавек на Зямлі. Тэорыя эвалюцыі грунтуецца на выніках біял. і грамадскіх навук. Іх узаемадзеянне па пытанні ўзнікнення чалавека і яго развіцця склала паняцце «сінтэтычная тэорыя эвалюцыі». Факты, якія пацвярджаюць роднасныя сувязі чалавека і жывёл, падзяляюцца на прамыя (касцявыя рэшткі выкапнёвага чалавека, яго бліжэйшых продкаў і блізкія да іх формаў) і ўскосныя (параўнальна-анатамічныя, фізіялагічныя, біяхімічныя, генетычныя і інш.).

Асн. прынцыпы навук. тэорыі А. (роднаснасць продкаў чалавека з чалавекападобнымі малпамі шымпанзэ, гарылай, арангутангам) абгрунтавалі ў канцы 19 ст. Ч.Дарвін і Т.Гекслі. Вывучэнне выкапнёвых рэштак паказала, што ў чалавека і ў сучасных малпаў былі агульныя продкі, якія засялялі Афрыку, Азію, часткова Еўропу больш за 20 млн. г. назад. У біял. эвалюцыі чалавека вылучаюць паслядоўныя стадыі: пераходных істот, або *аўстралапітэкаў*, якія з'явіліся каля 5 млн. г. назад; *архантрапаў* (жылі каля 1,5 млн. — 200—150 тыс. г. назад); *палеаантрапаў* (жылі больш за 100—35 тыс. г. назад); сучаснага чалавека (Homo sapiens; з'явіўся больш за 50 тыс. г. назад). Найб. важныя фактары А. — прыстасаванне (*адаптацыя*) да зменлівых умоў навакольнага асяроддзя праз працоўную дзейнасць і пераход ад раслінай ежы да мясной. Гэтыя змены ў паводзінах былі выкліканы пагаршэннем умоў існавання ў ледавіковую эпоху.

Вылучаецца біял. адаптацыя, у ходзе якой мяняюцца марфалагічныя асаблівасці (прамахаджэнне і звязаная з ім зменлівасць верхніх і ніжніх канечнасцяў, будова таза і інш.), і адаптацыя паводзін, звязаных са зменай спосабаў жыцця (гл. *Адаптацыя сацыяльная*). Развіццё грамадства (сацыягенез) адбывалася разам з біял. эвалюцыяй чалавека. Першыя прылады працы з'явіліся больш за 2 млн. г. назад. Мова як сродак зносін людзей сфарміравалася на стадыі архантрапаў. На стадыі палеаантрапаў пачалі фарміравацца ідэалагічныя ўяўленні, якія працягваюць развівацца ў людзей больш позніх відаў, а таксама выявіліся культ. адрозненні — аснова сучасных этнічных асаблівасцяў.

*Літ.*: Алексеев В.П. Становление че-

Антракноз: 1 — фасолі; 2 — агуркоў; 3 — чорных парэчак.

ловечества. М., 1984; Тегако Л.И., Саливон И.И. Основы современной антропологии. Мн., 1989; Фоули Р. Еще один неповторимый вид: Пер. с англ. М., 1990.

*Л.І.Цягака.*

**АНТРАПАГЕНЕ́ТЫКА** (ад *антропа...* + *генетыка*), раздзел *генетыкі* і *антрапалогіі*, які вывучае спадчыннасць і зменлівасць нармальных прыкмет чалавека, а таксама пэўных груп людзей (ад папуляцый да рас у працэсе іх індывідуальнага эвалюц. і сац. развіцця). Паталагічныя прыкметы і спадчынныя ненармальнасці вывучае *генетыка медыцынская*. А. мае 2 асн. кірункі: даследаванне зменлівасці і генетычнага складу папуляцый з аналізам прычын фарміравання генафонду чалавека і даследаванне спадчыннай зменлівасці пад уплывам змен навакольнага асяроддзя, а таксама ў працэсе біял. эвалюцыі з абгрунтаваннем яе тэндэнцыі. Сучасныя метады вывучэння прыкмет людзей з розным тыпам спадчыннасці (у першую чаргу храмасомнага апарату, фактараў крыві, асаблівасцяў скурнага рэльефу далоняў, колеру вачэй, формы носа і інш.) грунтуюцца на дасягненнях і метадах біяхіміі, імуналогіі, папуляцыйнага аналізу і інш. раздзелаў біял. навукі.

*Літ.:* Алексеев В.П. Очерки экологии человека. М., 1993; Фогель Ф., Мотульски А. Генетика человека: Пробл. и подходы: Пер. с англ. Т. 1—3. М., 1989—90.

*Л.І.Цягака.*

**АНТРАПАГЕ́ННАЕ ЎЗДЗЕ́ЯННЕ** на прыроду, прамы або апасродкаваны ўплыў чалавецтва на прыроду, што прыводзіць да кропкавых, лакальных, рэгіянальных ці генералізаваных (амаль да глабальных) яе змен. Пастаянна павялічваецца з развіццём прадукц. сіл і інтэнсіфікацыяй прыродакарыстання, з'яўляецца аб'ектыўнай рэаліяй, якая складае аснову *пераўтварэння прыроды* і абумовіла зараджэнне і развіццё тэорыі і практыкі *аховы прыроды*, а таксама сістэм рацыянальнага *прыродакарыстання*.

*Літ.:* Митрюшкин К.П., Шапошников Л.К. Прогресс и природа. М., 1978; Риклефс Р. Основы общей экологии: Пер. с англ. М., 1979.

**АНТРАПАГЕ́ННАЯ НАГРУ́ЗКА**, прамое або апасродкаванае *антрапагеннае ўздзеянне* на прыроднае асяроддзе ў цэлым або на асобныя прыродныя экасістэмы ці іх кампаненты. Дыферэнцыруецца па аб'ектах і відах уздзеяння (напр., А.н. на лясныя, водныя экасістэмы, паветра, флору, фауну і інш.; фізічнае, мех., хімічнае ўздзеянне і г.д.). Ацэньваецца па якасных і колькасных паказчыках, праз сетку станцый і ўстаноў глабальнага, рэгіянальнага і інш. відаў *маніторынгу*, экалагічнага назірання і кантролю. На сучасным этапе развіцця прадукцыйных сіл А.н. на асяроддзе ў цэлым падвойваецца кожныя 10—15 гадоў.

**АНТРАПАГЕ́ННАЯ РЭДУ́КЦЫЯ БІЯСФЕ́РЫ**, неабарачальны працэс памяншэння відавой разнастайнасці *біясферы*, абумоўлены пераўтваральнай дзейнасцю чалавека. Адбываецца пры урбанізацыі, забруджванні асяроддзя, знішчэнні лясоў, узорванні стэпаў, залішняй здабычы прамысл. жывёл, некантраляваным збіранні ядомых і лек. раслін, пры зарэгуляванні рэк, неарганізаваным турызме і г.д. Па падліках Міжнар. саюза аховы прыроды і прыродных рэсурсаў кожны год на Зямлі знікае па аднаму віду раслін або жывёл. У сувязі з гэтым распрацаваны і прыняты міжнар. канвенцыі і дагаворы па ахове генетычнага фонду жывёльнага і расліннага свету, пашыраюцца сеткі біясферных запаведнікаў, нац. паркаў і інш.

**АНТРАПАГЕ́ННЫ ЛАНДША́ФТ**, ландшафт, які ўзнік у працэсе пераўтваральнай дзейнасці чалавека, у т.л. яго ненаўмыснага ўздзеяння на прыроду. Займае каля палавіны тэрыторыі сушы. Вылучаюць А.л. па ступені зменнасці (слабазменены, зменены, моцназменены), па сацыяльна-эканам. функцыях (с.-г., індустрыяльны, урбанізаваны, рэкрэацыйны, запаведны, прыродаахоўны і інш.), па выніках антрапагенных уздзеянняў (акультураны, пераўтвораны, дэградзіраваны). На Беларусі А.л. займае больш палавіны тэрыторыі. Распрацавана класіфікацыя А.л., вылучаны тыпы, падтыпы, віды.

**АНТРАПАГЕ́ННЫ РЭЛЬЕ́Ф**, рэльеф, створаны ці зменены дзейнасцю чалавека; частка *антрапагеннага ландшафту*. Формы А.р. ўзніклі з пачаткам гасп. дзейнасці (паляўнічыя ямы, пячоры, эрозія глебаў на пашах і інш.). Свядомае пераўтварэнне рэльефу адбываецца пры меліярацыі зямель, буд-ве, рэкультывацыі парушаных ландшафтаў. Стыхійна ўзнікаюць формы А.р. ў выніку нерацыянальнага вядзення сельскай і лясной гаспадаркі, буд-ва. горных выпрацавак, пракладкі дарог, выпрабаванняў ядз. зброі: ямы, прасяданні глебы, конусы вынасу, водмелі, рухомыя пяскі, камяністыя россыпы, кар'еры, адвалы, тэрыконы і інш.

**АНТРАПАГЕ́ННЫЯ ЗМЕ́НЫ КЛІ́МАТУ**, змены кліматычных умоў пад уплывам гасп. дзейнасці чалавека, адзін з відаў і вынікаў *антрапагеннага ўздзеяння* на прыроду. Памяншэнне лясістасці і павелічэнне разаранасці, меліярацыя, гідратэхн. збудаванні, рост гарадоў і дарожнай сеткі адбіваюцца на *мікраклімаце* і *мезаклімаце* (мясц. клімаце). Глабальныя змены клімату звязваюць з праяўленнем *парніковага эфекту* ў атмасферы, які вядзе да пацяплення. Павелічэнне прамысл. выкідаў у атмасферу выклікае зніжэнне прытоку сонечнай радыяцыі да зямной паверхні і пахаладанне клімату, што ў значнай ступені зніжае магчымасць парніковага эфекту. Т-ра паветра Зямлі за апошняе стагоддзе павялічылася на 0,5—0,6 °С. Мяркуюць, што змены клімату найб. значныя ў зімовы перыяд; пацяпленне клімату да 2015 складзе 1 °С. На Беларусі А.з.к. выяўляюцца пераважна ў мясц. клімаце (за апошнія 30 гадоў сярэдняя т-ра зімовых месяцаў павялічылася на 0,4 °С) і мікраклімаце меліяраваных зямель і ў гарадах. На асушаных балотах мінім. т-ра паветра на 3—5 °С ніжэй, чым на сухадолах, што павялічвае інтэнсіўнасць замаразкаў, скарачае вегетац. перыяд. У Мінску сярэднямесячная т-ра паветра на працягу большай часткі года павышаецца з-за гасп. дзейнасці на 0,2—0,6 °С, утварэнне ўстойлівага снегавога покрыва затрымліваецца на 3—4 дні і на некалькі дзён раней яно сыходзіць, памяншаецца абсалютная вільготнасць і павялічваецца колькасць сухіх дзён і ападкаў і інш. У сувязі з ростам уздзеяння чалавека на прыроду А.з.к. набываюць глабальны характар. *У.Ф.Логінаў.*

Антрапагенны рэльеф у зоне здабычы калійных солей каля г. Салігорск.

**АНТРАПАГЕ́ННЫЯ РЭ́ЧЫВЫ**, хімічныя злучэнні, якія трапляюць у навакольнае асяроддзе ў выніку гасп. дзейнасці чалавека. Бываюць аналагамі прыродных злучэнняў, лёгка ўключаюцца ў натуральны кругаварот і утылізуюцца ў экасістэмах або чужародным для прыроднага асяроддзя і з цяжкасцю разбураюцца пад уплывам біятычных фактараў. Да чужародных належаць многія т.зв. ўстойлівыя забруджвальнікі навакольнага асяроддзя, якія нярэдка аказваюцца небяспечнымі для існавання жывых арганізмаў (напр., радыеактыўныя ізатопы з працяглым перыядам паўраспаду). Усяго вядома каля 100 тыс. відаў А.р., сярод іх шмат сінтэтычных, якія ніколі не існавалі ў прыродным асяроддзі.

**АНТРАПАГЕ́ННЫЯ ФА́КТАРЫ**, рухальныя сілы, якія ўплываюць на прыродныя працэсы і паходжаннем звязаны з існаваннем і дзейнасцю чалавека. Сукупны ўплыў А.ф. фарміруе *антрапагеннае ўздзеянне* на прыроду, што адбываецца ў комплексе з абіятычнымі і біятычнымі фактарамі і характарызуецца цеснай сувяззю і ўзаемазалежнасцю паміж імі. Адмоўнае і станоўчае значэнне А.ф. для існавання жывых арганізмаў і чалавека выяўляецца на ўзроўні асобных экасістэм (найб. яскрава) і біясферы ў цэлым, улічваецца пры планаванні і распрацоўцы мерапрыемстваў па ахове прыроды.

**АНТРАПАГЕ́Я** (ад *антрапа...* + грэч. gē Зямля), сукупнасць экасістэм, якія ствараюцца ў выніку творчай або разбуральнай дзейнасці чалавека. Гл. таксама *Наасфера*.

**АНТРАПАЗААНО́ЗЫ** [ад *антрапа...* + *заа...* + *...оз*(ы)], зоаантрапанозы, інфекцыйныя і інвазійныя хваробы, агульныя для жывёл і чалавека. Крыніца інфекцыі хворыя жывёлы, з якімі чалавек кантактуе. Многія А. — *трансмісіўныя хваробы*, характарызуюцца прыроднай ачаговасцю. У мед. л-ры А. наз. *заанозамі*.

А. выклікаюцца бактэрыямі (*бруцэлёз, злаякасны ацёк, сап, слупняк, сібірская язва, туберкулёз, тулярэмія*, чума вярблюдаў, меліяідоз, харч. таксікаінфекцыі і інш.), вірусамі (*арнітоз, шаленства, яшчур*, кляшчовы энцэфаліт, інфекцыйны энцэфаламіэліт коней і інш.), грыбкамі (*актынамікоз, парша*, стрыгучы лішай), спірахетамі і лептаспірамі (*лептаспіроз*, клешчавы зваротны тыф), рыкетсіямі (Ку-ліхаманка, пацуковы рыкетсіёз, паўночна-азіяцкі клешчавы сыпны тыф), прасцейшымі (*таксаплазмоз, трыпаназамоз*, лейшманіёз і інш.), членістаногімі (акароз), гельмінтамі (*дыфілабатрыёзы, апістархоз, тэніідоз, трыхінелёз, эхінакакоз*, тэніярынхоз).

**АНТРАПАЛАГІ́ЗМ**, метадалагічная канцэпцыя тлумачэння сусвету, прыроды, грамадства і мыслення праз паняцце «чалавек» як асн. светапоглядную катэгорыю. Пры гэтым чалавек уяўляецца пераважна як з'ява прыроды, г.зн. натуралістычна.

Мае псіхічныя і гнасеалагічныя вытокі. У старажытнасці пры адсутнасці дастатковых ведаў у чалавека была псіхічная патрэба перадолець сваю адчужанасць і залежнасць ад рэальнасці ачалавечваннем гэтай рэальнасці, «насяляючы» яе чалавекападобнымі фантомамі (багамі, духамі і інш.). З пашырэннем ведаў усталявалася сцвярджэнне, што чалавек як вышэйшая істота на лесвіцы эвалюцыі — «мера ўсіх рэчаў». Адсюль і навакольны свет, адлюстраваны ў думках чалавека, можа ўспрымацца як уласнае тварэнне (суб'ектыўны ідэалізм). Вытлумачэнне суб'ектам аб'екта па аналогіі з самім сабой — самы просты і даступны спосаб у пазнанні. Старажытным мадэльным вытокам А. быў *антрапамарфізм*.

Сутнасць антрапаморфных фантомаў думкі адным з першых асэнсаваў стараж.-грэч. філосаф Ксенафан (вобразы багоў людзі лепяць з сябе). Найб. вядомыя прадстаўнікі матэрыялісц. А. — К.Гельвецый, Л.Феербах, М.Г.Чарнышэўскі, ідэалістычнага — Ф.Ніцшэ, В.Дзільтэй, Г.Зімель, М.Шэлер. Як метадалаг. прынцып А. пашыраны ў філасофіі, сацыялогіі (гл. *Антрапасацыягенез*), этыцы, эстэтыцы і інш. Марксізм адмаўляў навуковасць А., ажыццяўляў сацыяліст. канструяванне грамадства без усебаковага ўліку асаблівасцяў чалавека, што прывяло да краху яго сац.-паліт. дактрыны.

*Літ.*: Чернышевский Н.Г. Антропологический принцип в философии // Чернышевский Н.Г. Избр. филос. соч. М., 1951. Т. 3; Ницше Ф. По ту сторону добра и зла; К генеалогии морали: Пер. с нем. Мн., 1992.

*А.В.Ягораў.*

**АНТРАПАЛАГІ́ЧНАЯ РЭКАНСТРУ́КЦЫЯ**, гл. *Рэканструкцыя антрапалагічная*.

**АНТРАПАЛАГІ́ЧНЫЯ ТЫ́ПЫ**, у расавай класіфікацыі — групы людзей з комплексам пэўных марфал. прыкмет (будова цела, шкілета, чэрапа, колер скуры, вачэй, валасоў і інш.); дробныя адзінкі адной расы. А.т. фарміруюцца як спадчынныя асаблівасці, што склаліся пад уздзеяннем прыродных і сац. фактараў за многія пакаленні. Арэалы пашырэння А.т. звычайна не супадаюць з этнічнымі ці дзярж. межамі, бо не супадаюць час і заканамернасці фарміравання гэтых супольнасцяў. Да аднаго А.т. могуць належаць некалькі розных народаў (гэта сведчыць пра іх фарміраванне на генетычна роднаснай аснове) або адзін народ можа складацца з некалькіх А.т. з прычыны неаднароднасці яго паходжання. Адносная стабільнасць А.т. у часе і прасторы ўлічваецца пры вызначэнні генетычнай роднасці пэўных этнатэрытарыяльных груп або выяўленні напрамку і ступені іншароднай прымесі ў выніку гіст. перамяшчэнняў і скрыжаванняў розных плямёнаў і народаў. На тэр. Беларусі вылучаюць верхнедняпроўскі (паўн.) і палескі (паўд.) А.т. Сярод першага тыпу часцей сустракаюцца людзі са светлымі адценнямі вачэй і валасоў, увагнутай спінкай носа, з больш высокім ростам. Акрамя таго, з ПдЗ на ПнУ Беларусі ў насельніцтва назіраецца невялікае паслабленне еўрапеоідных рыс: больш нізкая і шырокая пераносіца, змешаныя адценні колеру вачэй, менш густая барада. Асаблівасці будовы твару, цела, звязаныя з тэр. разменкаваннем, і інш. прыкметы дазваляюць аднесці беларусаў да ўсходнееўрап. варыянта (балтыйскага тыпу) еўрапеоіднай расы.

*І.І.Салівон.*

**АНТРАПАЛО́ГІЯ** (ад *антрапа...* + *...логія*), галіна прыродазнаўства, якая вывучае паходжанне, эвалюцыю і заканамернасці біял. асаблівасцяў чалавека і яго рас. Цесна звязана з прыродазнаўча-гіст. навукамі. Мае 3 асн. раздзелы: расазнаўства (вывучае ўмовы і прычыны ўтварэння, заканамернасці фарміравання і ўзаемадзеяння рас; часткай раздзела з'яўляецца і этнічная А., якая даследуе праблемы этнагенезу), *антрапагенез* і марфалогія (вывучае заканамернасці зменлівасці будовы цела і органаў чалавека ў залежнасці ад спадчыннасці, умоў жыцця і працы). Апошні раздзел уключае таксама саматалогію (узроставыя варыяцыі будовы цела сучаснага чалавека), мералогію (варыяцыі яго асобных органаў), *дэрматагліфіку, адонталогію, палеаантрапалогію*. З 1960-х г. вылучаюць раздзелы: фізіялагічная А. (вывучае варыяцыі функцыянальных асаблівасцяў арганізма чалавека і працэсы яго адаптацыі), *антрапагенетыка, генагеаграфія*.

Першыя звесткі пра А. ёсць у працах Герадота (5 ст. да н.э.), Арыстоцеля (4 ст. да н.э., увёў тэрмін «А.» як вучэнне пра духоўную прыроду чалавека) і інш. Вял. геагр. адкрыцці 15—16 ст. далі магчымасць пазнаёміцца з народамі Амерыкі, Афрыкі, Акеаніі, Усх. Азіі і распачаць сістэматызацыю рас чалавека. Як навука А. сфарміравалася ў 19 ст., калі пачалі збірацца і сістэматызавацца звесткі пра розныя тыпы стараж. і сучаснага насельніцтва, распрацоўвацца методыкі даследаванняў. Абвастрэнне супярэчнасцяў паміж метраполіямі і калоніямі ў канцы 19 ст. спрыяла ўзнікненню антынавук. расісцкіх «тэорый» (гл. *Расізм*). Ідэі біял. роўнасці ўсіх рас закладзены ў 2-й пал. 19 — пач. 20 ст. ў працах рус. вучоных К.М.Бэра, А.П.Багданава, Дз.М.Анучына, М.М.Міклухі-Маклая і развіты В.В.Бунаком, Ф.Боасам, Г.Ф.Дэбецам, Ф.Лушанам, Л.Нідэрле, Я.Я.Рагінскім, Г.А.Бонч-Асмалоўскім, М.Р.Левіным, М.М.Чабаксаравым, В.П.Аляксеевым, А.А.Зубавым і інш.

Даследаванні антрапал. складу беларусаў пачаліся ў канцы 19 — пач. 20 ст. (Анучын, М.А.Янчук, К.М.Ікаў, А.Н.Раждзественскі, А.Л.Здраеўскі, А.А.Піянткоўскі, Я.Мыдлярскі, Ю.Д.Талька-Грынцэвіч). Вынікі іх даследаванняў абагульнялі А.А.Іваноўскі (1905), Я.М.Чапуркоўскі (1918). У 1920—30-я г. Бунак вывучаў фізічны тып і размеркаванне груп крыві ў беларусаў, даследаваў краніялагічныя калекцыі сярэдневяковага насельніцтва Беларусі. Па ініцыятыве А.К.Ленца ў 1926 пры Інбелкульце створана антрапал. камісія, пазней рэарганізаваная ў кафедру антрапалогіі БелАН. Ю.М.Верамецкая, А.Я.Вішнеўская, А.А.Смірноў, Д.Н.Эйнгорн пачалі планамерныя даследаванні насельніцтва Слуцкага, Мазырскага, Магілёўскага, Аршанскага

р-наў. Рэарганізацыя кафедры А. ў НДІ псіханеўралогіі перапыніла антрапал. даследаванні на Беларусі. У 1930—40-я г. антрапал. склад насельніцтва пач. 2-га тыс. н.э. вывучалі супрацоўнікі Ін-та этнаграфіі АН СССР Дэбец, Т.А.Трафімава, потым В.В.Сядоў, Т.І.Аляксеева, М.С.Веліканава. Антрапалагічныя асаблівасці сучасных жыхароў Беларусі ў 1950-я г. вывучалі В.У.Вітоў, Р.Я.Дзянісава, Бунак, У.Дз.Дзячэнка. У 1965 пры Ін-це мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР створана група А. (у 1990 пераўтворана ў аддзел А. і экалогіі). Пачаліся планамерныя комплексныя антрапал. даследаванні фізічнага тыпу старажытнага (І.І.Салівон, А.І.Кушнір) і сучаснага (Салівон) насельніцтва Беларусі, заканамернасцяў росту і развіцця вучняў у розных экалагічных рэгіёнах рэспублікі (Салівон, Н.І.Поліна), дэрматагліфічных і аданталагічных асаблівасцяў (Л.І.Цягака), размеркавання груп крыві і інш. фенатыпаў, генетычна абумоўленых прыкмет у сельскага насельніцтва (А.І.Мікуліч), генадэмаграфічных — у гарадах рэспублікі (В.У.Марфіна). Пасля Чарнобыльскай катастрофы 1986 даследаванні накіраваны на вывучэнне заканамернасцяў адаптыўных працэсаў у экстрэмальных умовах.

*Літ.*: Тегако Л.И. Антропологические исследования в Белоруссии. Мн., 1979; Тегако Л.И., Салівон И.И. Основы современной антропологии. Мн., 1989.

*І.І.Салівон.*

**АНТРАПАМАРФІ́ЗМ** (ад *антрапа...* + грэч. morphē форма, від), прыпадабненне да чалавека, надзяленне чалавечымі ўласцівасцямі прадметаў і з'яў нежывой прыроды, нябесных целаў, жывёлін, міфічных істот. Узнік як першапачатковая форма светапогляду чалавека на ранніх ступенях развіцця грамадства (гл. *Анімізм*). А. уласцівы большасці рэліг. уяўленняў пра багоў і інш. звышнатуральных істот (багі т.зв. вышэйшых рэлігій, язычніцкія багі і інш.). Антрапаморфныя панятці выкарыстоўваюць і ў сучаснай навук.-тэхн. л-ры (камп'ютэр «запамінае», «рашае задачу» і г.д.), для эмацыянальнай выразнасці ў выяўл. мастацтве, паэзіі, прозе («зямля спіць», «мора хвалюецца»).

**АНТРАПАМЕ́ТРЫЯ** (ад *антрапа... + ...метрыя*), адзін з прыёмаў антрапал. даследавання, які заключаецца ў вымярэнні чалавечага цела і яго частак для ўстанаўлення палавых, узроставых, расавых і інш. структурных асаблівасцяў. Вылучаюць вымярэнні: цела — самаметрыю, касцей шкілета — астэаметрыю, чэрапа — краніяметрыю. Для дакладнага вымярэння і фіксацыі прыкмет існуюць спец. інструменты (цыркулі, антрапаметры, ґаніёметры, стужкі і інш.). Для якаснай характарыстыкі прыкмет, якія нельга вымяраць (рысы твару, колер скуры, валасоў, вачэй і інш.), складзены спец. шкалы.

**АНТРАПАНІ́МІКА** (ад *антрапа...* + грэч. onyma імя), раздзел *анамастыкі*, які вывучае ўласныя імёны людзей.

**АНТРАПАСАЦЫЯГЕНЕ́З**, інтэгральнае панятце, выпрацаванае тэарэтычным навук. мысленнем для цэласнага разумення чалавека ў яго гіст. і індывід. развіцці. Дае магчымасць: пазбегнуць аднабаковых тлумачэнняў паходжання чалавека (з пазіцый антрапа- і сацыягенезу, біялагізатарства, расізму, нацыяналізму); разглядаць пачатак чалавечай гісторыі ў дынаміцы эвалюцыйна-біял. перадумоў і матэрыяльна-дзейнасных фактараў гамінізацыі; зразумець прыроду як «неарганічнае цела» чалавека, што фарміруецца ў гіст. працэсе грамадства.

Выкарыстанне прынцыпу гістарызму да антрапалагічных праблем дае магчымасць раскрыць сац. сутнасць матэрыяльнага (фізічнага, біялагічнага) цела чалавека на ўзроўні яго філа- і антагенезу. Вял. мозг, рукі, здольнасць прама хадзіць, мысліць, гаварыць і інш. ўласцівыя чалавеку рысы — усё гэта жывая матэрыя, прырода. У той жа час гэта прырода чалавека фарміруецца самім соцыумам у працэсе яго гіст. развіцця. Дзіця пры нараджэнні атрымлівае ў спадчыну матэрыяльныя формы і задаткі чалавека, але самі па сабе яны яшчэ не робяць яго чалавекам. Ці стане мысліць і гаварыць дзіця, аб чым яно будзе мысліць і на якой мове размаўляць — усё залежыць ад сац. умоў жыцця. А. мае на мэце і даследаванне перспектыў змены матэрыяльных формаў і патэнцый чалавека ў працэсе натуральна-гіст. развіцця соцыуму, яго дэфармацыі і дэградацыі.

*Літ.*: Ефимов Ю.И. Философские проблемы теории антропосоциогенеза. Л., 1981; Проблемы современной антропологии. Мн., 1983; Поршнев Б.Ф. О начале человеческой истории. М., 1974.

*А.І.Пятрушчык.*

**АНТРАПАСАЦЫЯЛО́ГІЯ**, 1) вучэнне, паводле якога развіццё грамадства зводзіцца да канкурэнцыі расавых тыпаў; адна з антыгуманных біялагізатарскіх канцэпцый у *антрапалогіі*. Створана ў канцы 19 ст. франц. вучоным Ж.В. дэ Лапужам і ням. О.Аманам, якія спрабавалі даказаць, што псіхічныя асаблівасці брахікефалаў (кароткагаловых) больш нізкія ў параўнанні з доліхакефаламі (доўгагаловымі). Прадстаўнікі А. лічаць, што вышэйшыя псіхічныя якасці ўласцівыя толькі т.зв. арыйскаму — доўгагаловаму светлавалосаму тыпу, пашыранаму ў Паўн. і Цэнтр. Еўропе. Адкрыты Ч.Дарвінам прынцып барацьбы за існаванне паміж біял. відамі яны пераносілі на гісторыю чалавецтва, якую разглядалі як барацьбу асобных рас. Сцвярджэнне, што гісторыя чалавецтва падпарадкоўваецца не сацыяльным, а біял. законам, паўтарае і амер. вучоны, стваральнік сацыябіялогіі Э.Уілсан, які лічыць, што гуманітарныя і сац. навукі можна разглядаць як спецыялізаваныя раздзелы біялогіі. 2) Адзін з кірункаў у *сацыялогіі*. Узнікла ў канцы 19 — пач. 20 ст. на аснове тэорыі аб арыйцах як вышэйшай расе. Найб. развіццё атрымала ў Германіі. Новыя сацыялагічныя факты разглядае з пункту погляду антрапал. вучэння пра чалавека, яго цялесную арганізацыю і абумоўленыя антрапаметрыяй псіхічны стан, пачуцці, мысленне, волю, памяць, іх змены пад уздзеяннем культуры, індустр. тэхналогіі і ўласнай культуратворнай дзейнасці чалавека. Агульнатэарэт. пачатак А. — гэта фіксацыя адрознення чалавека ад жывёл. Неразвітасць у чалавека прыродных сродкаў самазабеспячэння стала ў прадстаўнікоў А. вядучым метадалаг. прынцыпам аналізу грамадскага жыцця. Сваю «недастатковасць» чалавек кампенсуе культурай, а адсутнасць прыроджаных генет. праграм паводзін папаўняе праграмамі сац. наследавання. Культура, паводле А., гэта біялагічна неабходны працэс ператварэння знешняй прыроды ў жыццёвае асяроддзе. «Акультураная» прырода ўключае прылады працы, тэхніку, тэхналогію, сродкі камунікацыі і «сац. парадкі» (грамадскія ін-ты). Праблемамі А. з'яўляюцца таксама антрапал. змены сучаснага чалавека, што прынеслі з сабой тэхнізацыя, індустр. грамадства, навук.-тэхн. прагрэс. *Л.І.Цягака, С.А.Шавель.*

**АНТРАПАСІСТЭ́МА** (ад *антрапа... + сістэма*), чалавецтва, якое развіваецца як адзінае цэлае і складаецца з чалавека як біял. віду, яго матэрыяльнай і духоўнай культуры, прадукц. сіл і вытв. адносін грамадства. Існуе ў непарыўным адзінстве з антрапасферай.

**АНТРАПАСО́ФІЯ** (ад *антрапа...* + грэч. sophia мудрасць), акультна-містычнае вучэнне пра чалавека як носьбіта таямнічых духоўных сіл; разнавіднасць *тэасофіі*. Заснавальнік А. ням. філосаф-містык Р.Штайнер стварыў у 1913 антрапасофскую школу з мэтай выхаваць у юнацтва ўменне «духоўнага сузірання», якое ў стане самыя таямнічыя з'явы рабіць даступнымі для ўспрымання. Паводле гэтага вучэння, чалавек — трыадзінства цела, душы і духу, духам кіруе закон пераўвасаблення (рэінкарнацыя). У асобным жыцці чалавечы дух паўтарае сам сябе з улікам ранейшых ураджанняў і перажыванняў. Чалавечае цела кіруецца законам наследавання, душа — створаным ёю самой лёсам (карма). Пасля смерці сувязь духу і душы захоўваецца, пакуль душа не вызваліцца ад цела. У сац.-паліт. жыцці А. зыходзіць з раздраблення сац. арганізма на самастойныя сферы: дзяржаву, прававыя, эканоміку. У 1-й трэці 20 ст. вучэнне А. стала пашыраным у шэрагу краін Еўропы. Пэўны ўплыў яно зрабіла на дзеячаў культуры і мастацтва (А.Белы, В.Кандзінскі, М.Валошын, Б.Вальтэр і інш.). Цікавасць да А. ажывілася і ў апошняй трэці 20 ст., асабліва

ў ЗША, еўрап. краінах. У апошнія гады распаўсюдзілася на Беларусі, гал. чынам гэтаму садзейнічалі аднаўленне цікавасці да тэасофскіх ідэй А. Блавацкай і ўзнікненне суполак крышнаітаў.

*Літ.*: Белый А. Рудольф Штейнер и Гете в мировоззрении современности. М., 1917; Abendroth W. R. Steiner und die heutige Welt. München, 1969. *Я.М.Бабосаў.*

**АНТРАПАФА́ГІЯ**, людаедства; гл. *Канібалізм.*

**АНТРАПАФІ́ТЫ** [ад *антрапа...* + *...фіт*(ы)], расліны, якія не звязаны з прыродным развіццём мясц. флоры (у адрозненне ад *апафітаў*) і ўвайшлі ў яе ў выніку гасп. дзейнасці чалавека. Падзяляюцца на археафіты (віды, якія трапілі ў флору да канца 15 ст.) і кенафіты (ад пач. 16 ст. і да цяперашняга часу). Да археафітаў належыць большасць пустазелля, да кенафітаў — *адвентыўныя расліны* і *інтрадукаваныя расліны*. У флоры Беларусі А. больш за 400 відаў.

**АНТРАПАФО́БЫ** [ад *антрапа...* + *...фоб*(ы)], расліны і жывёлы, якія не пераносяць змены ўмоў існавання пад уплывам дзейнасці чалавека, напр. *адоніс, кавыль* не церпяць узмоцненай пасьбы, касьбы.

**АНТРАПАЦЭНАЛО́ГІЯ** (ад *антрапа...* + *цэна...* + *...логія*), раздзел *экалогіі* чалавека, які вывучае ўзаемаадносіны згуртавання людзей з навакольным асяроддзем (як правіла, у вузкарэгіянальных межах).

**АНТРАПАЦЭНТРЫ́ЗМ** (ад *антрапа...* + *цэнтр*), погляд, паводле якога чалавек ёсць цэнтр і вышэйшая мэта светабудовы. Цесна звязаны з *тэлеалогіяй*. У ант. філасофіі прынцып А. сфармуляваны Пратагорам («Мера ўсіх рэчаў — чалавек»), развіты ў этычным рацыяналізме Сакрата. Рысы А. назіраюцца ў прадстаўнікоў сярэдневяковай філасофіі (патрыстыка, Аўгусцін, Бернар Клервоскі і інш.). Прынцыпова новы характар А. набыў у культуры Адраджэння, калі ўвага мысліцеля акцэнтавалася на прыгажосці і велічы чалавека, яго высокім прызначэнні. Элементы А. захоўваліся ў класічнай зах. філасофіі (К.Гельвецый, Л.Феербах), былі ўласцівы філосафам рэліг. і ірацыяналісцка-экзістэнцыяналісцкай арыентацыі (Г.Марсель, А.Камю і інш.). На Беларусі ідэі А. вядомы з 11 ст. — з пашырэннем твораў патрыстычнай л-ры. У грамадскай думцы і культуры Беларусі 15—17 ст. зацвярджаецца гуманістычны А. Адраджэння. Бел. мысліцелі-гуманісты (М.Гусоўскі, Ф.Скарына, Сімяон Полацкі) адстойвалі высокую годнасць чалавека, грамадскае прызначэнне яго дзейнасці, самакаштоўнасць зямнога жыцця. *Г.У.Грушавы.*

**АНТРАХІНО́Н**, арганічнае рэчыва, $C_{14}H_8O_2$. Мал. м. 208,2. Светла-жоўтыя крышталі, $t_{пл}$ 286 °С, растваральны ў нітрабензоле, аніліне, гарачым талуоле, практычна не растваральны ў вадзе і спірце. Праяўляе ўласцівасці *хінонаў*. Атрымліваюць каталітычным акісленнем антрацэну ці з фталевага ангідрыду і бензолу. Выкарыстоўваюць у вытв-сці *антрахінонавых фарбавальнікаў*. Выклікае экзэмы і бранхіяльную астму (ГДК 5 мг/м$^3$).

**АНТРАХІНО́НАВЫЯ ФАРБАВА́ЛЬНІКІ**, клас арганічных фарбавальнікаў, вытворных *антрахінону*. Адметныя хім. устойлівасцю, яркасцю колеру, устойлівасцю да святла і мокрай апрацоўкі. Неабходны колер і адценне А.ф. атрымліваюць дзякуючы ўвядзенню ў будову антрахінону розных замяшчальнікаў. Падзяляюцца на *пратраўныя фарбавальнікі* (напр., *алізарын*), якія ўтвараюць на валакне ўстойлівыя нерастваральныя комплексы з іонамі алюмінію, хрому, жалеза; водарастваральныя *кіслотныя фарбавальнікі* (напр., антрацэн сіні) для воўны і шоўку; *асноўныя фарбавальнікі*, растваральныя ў вадзе для капрону, нейлону і нерастваральныя для ацэтатнага шоўку і поліэфірных валокнаў; *кубавыя фарбавальнікі* (напр., 1,5-дыамінаантрахінон). Выкарыстоўваюцца таксама для фарбавання каўчуку, гумы, мінер. масла, у паліграф. і лакафарбавай вытв-сці.

А.Антропаў. Партрэт А.Ізмайлавай. 1759.

**АНТРАЦЫ́Т** (ад грэч. anthrakitis від вугалю), выкапнёвы вуголь найвышэйшай ступені вуглефікацыі. Колер шараватачорны і чорна-шэры. Бляск металічны. Цв. 2—2,5. Шчыльн. 1500—1700 кг/м$^3$. Не спякаецца. Мае вугляроду 94—97%, вадароду 1—3%. Удзельная цеплыня згарання 33,8—35,2 МДж/кг. У гаручай масе да 9% лятучых рэчываў. Найб. колькасць А. ўтварылася ў выніку рэгіянальнага метамарфізму пры апусканні вугляносных тоўшчаў у вобласць павышаных тэмператур (350—550 °С) і ціскаў. Высакаякаснае бяздымнае энергет. паліва, тэхнал. сыравіна ў горнай і каляровай металургіі, хім., электратэхн. прам-сці (вытв-сць карбідаў, электродаў і інш.). Гал. радовішчы А. ў Расіі, на Украіне, у ЗША, Кітаі.

**АНТРАЦЭ́Н**, араматычны вуглевадарод $C_{14}H_{10}$. Мал. м. 178,24. Жоўтыя крышталі з блакітнай флуарэсцэнцыяй, $t_{пл}$ 216 °С; растваральны ў спірце, эфіры, ацэтоне, нерастваральны ў вадзе. У высакачыстым стане — паўправаднік. Уступае ў рэакцыі далучэння з дыенафіламі, галагенамі, кіслародам, шчолачнымі металамі і інш. Атрымліваюць з каменнавугальнай смалы. Выкарыстоўваюць для вытв-сці *антрахінонавых фарбавальнікаў*, монакрышталі — для сцынтыляцыйных лічыльнікаў. А. раздражняе скуру і слізістыя абалонкі дыхальных шляхоў і вачэй.

**АНТРО́ПАЎ** Аляксей Пятровіч (25.3.1716, С.-Пецярбург — 23.6.1795), рускі жывапісец-партрэтыст. Вучыўся ў «Канцылярыі ад будаўніцтва» ў Пецярбургу (з 1732) у А.М.*Мацвеева*, з 1739 працаваў там у «жывапіснай камандзе» ў І.Я.Вішнякова. Удзельнічаў у размалёўцы палацаў у Пецярбургу (1744—50), яго прыгарадах і ў Маскве, Андрэеўскага сабора ў Кіеве (1752—55). Партрэты А. часткова звязаны з традыцыямі *парсуны*, жывапіснымі прыёмамі барока, адметныя праўдзівасцю характарыстык (А.Ізмайлавай, 1759, атамана Ф.І.Краснашчокава, 1761, Пятра III, 1762, і інш.).

**АНТРЫ́Т** (ад лац. antrum пячора, поласць + *...іт*), запаленне слізістай абалонкі і касцявых сценак поласці соскападобнага адростка скроневай косці — антрума. Назіраецца ў дзяцей першых месяцаў жыцця. Узнікае як ускладненне вострага сярэдняга атыту, іншы раз ад агульнага знясілення арганізма (пры таксічнай дыспепсіі, пнеўманіі). Падстава на падазрэнне А. — цяжкі, зацяжны, востры атыт і завушны абсцэс пасля прарыву гною з антрума. Лячэнне хірургічнае.

**АНТРЭ́** [ад франц. entree уваход, выхад (на сцэну)], 1) у цырку — першапачаткова з'яўленне клоуна на манежы. У сучасным цырку сюжэтная, размоўная ці пантамімічная сцэнка, якую выконвае клоун. Складаецца з рэпрызаў, эксцэнтрычных і буфанадных трукаў, элементаў пародыі і пантамімы. 2) У балеце — уступная частка разгорнутага па-дэ-дэ (па-дэ-труа), выхад аднаго ці некалькіх выканаўцаў.

**АНТРЭМО́Н** (Entremont), стараж. кельта-лігурыйскі абарончы і культавы цэнтр каля г. Экс-ан-Праванс (Францыя), сталіца плямёнаў соліяў. Пабудаваны ў 3 ст. да н.э., разбураны рымлянамі ў 124 да н.э. Гар. сцены з вежамі, складзеныя з каменных блокаў, захаваліся на выш. да 4 м. Раскопкамі выяўлены рэшткі чатырохвугольных каменных дамоў, каналізацыі. У найб. вы-

сокім месцы знаходзілася свяцілішча, дзе захаваліся каменныя слупы з выявамі мужчынскіх, жаночых і дзіцячых галоў, рэшткі шматлікіх скульптур — фігур воінаў і, верагодна, багоў.

**АНТРЭПРЫ́ЗА** (франц. entreprise), прыватнае відовішчнае прадпрыемства (тэатр, цырк і інш.), якое створана і ўзначальваецца *антрэпрэнёрам*.

**АНТРЭПРЭНЁР** (ад франц. entrepreneur прадпрымальнік), уладальнік, арандатар, гаспадар прыватнага відовішчнага прадпрыемства (т-ра, цырка і інш.) — *антрэпрызы* або арганізатар гастрольных турнэ труп і асобных акцёраў. У Зах. Еўропе вядомыя з сярэдзіны 16 ст., на Беларусі — з 1770-х г. Апрача камерцыйных існавалі А., звязаныя з т-рам творчымі адносінамі: А.-акцёр (Р.Бёрбедж, Англія), А.-рэжысёр (М.Райнгарт, Германія), А.-драматург (Ж.Б.Мальер, Францыя) і інш. Першым бел. А. быў І.*Буйніцкі*. Функцыі А. выконвалі Ф.*Ждановіч* і У.*Галубок*.

**АНТРЭСО́ЛЬ** (франц. entresol), 1) верхні паўпаверх, убудаваны ў аб'ём асн. паверха; характэрны для асабнякоў і сядзібных дамоў 18—19 ст. Выкарыстоўваюцца і ў інтэр'ерах сучасных грамадскіх збудаванняў, музеяў, выставачных залаў, тэатральных, клубных і інш. будынкаў. 2) Верхняя частка пакоя, падзеленая на 2 паўпаверхі. 3) У сучасным жылым доме — паліца пад столлю кватэры.

**АНТУА́Н** (Antoine) Андрэ (31.1.1858, г. Лімож — 19.10.1943), французскі рэжысёр і акцёр, тэарэтык т-ра. Арганізатар і дырэктар свабоднага т-ра (1887—95) і Т-ра Антуана (1897—1906), дырэктар т-ра «Адэон» (1906—14). З 1914 працаваў у кіно, займаўся тэатр. крытыкай. Прыхільнік і прапагандыст эстэт. прынцыпаў Э.Заля, адстойваў рэалізм у тэатр. мастацтве. Выступаў супраць рамесніцкай «касавай» драматургіі, за ўключэнне ў рэпертуар парыжскіх т-раў прагрэс. франц. і замежнай драмы. Паставіў інсцэніроўкі паводле рамана бр. Ганкур, п'есы Ж.Рэнара, Л.Талстога («Улада цемры», 1888), Г.Ібсена («Здані», 1890), Г.Гаўптмана («Ткачы», 1893) і інш. Выступаў супраць штампаў у акцёрскім і рэжысёрскім мастацтве. Характарны акцёр, майстар мізансцэны.

З лепшых роляў: Освальд («Здані»), Акім («Улада цемры») і інш.

*Літ.*: Антуан А. Дневники директора театра, 1887—1906: Пер. с фр. М.; Л., 1939.

**АНТЫ...** (грэч. anti...), прыстаўка, якая абазначае процілегласць, варожасць у адносінах да чаго-н., накіраванасць супраць чаго-н., тое, што і «проці...», напр., *антыбіётыкі, антыгены*.

**А́НТЫ** (грэч. Antai), назва аб'яднання ўсх.-слав. плямёнаў у творах візант. і готскіх пісьменнікаў 6 — пач. 7 ст. Засялялі стэп і лесастэп паміж Днястром і Дняпром. Асн. занятак — земляробства; пераважала сельская абшчына. Працэс складвання дзяржавы, які пачаўся ў 3—4 ст., не быў завершаны. Вядомы правадыры («рэксы») А. — Бож, Ардагаст, Пірагаст, Межамір і інш. Мелі моцную ваен. арг-цыю. У 4 ст. ваявалі з готамі, у 6 ст. — з Візантыяй і аварамі. На пач. 7 ст. аб'яднанне распалася.

**А́НТЫ** (лац. antae) у архітэктуры, выступы падоўжных сцен будынка, якія агароджваюць уваход. Найбольш часта сустракаюцца ў стараж.-грэч. храмах, тып якіх атрымаў назву «храм у антах».

**АНТЫАЗАНА́НТЫ**, хімічныя рэчывы, якія павышаюць устойлівасць гумы да разбурэння (растрэсквання) пад уздзеяннем атм. азону. Падзяляюцца на хімічнаактыўныя (рэагуюць з азонам з большай скорасцю, чым макрамалекулы каўчуку) і інертныя (утвараюць на паверхні вырабу эластычную ахоўную

Анты ў архітэктуры.

плёнку, напр., парафін, воск і інш.). Уваходзяць у гумавую сумесь пры яе вытв-сці (1—3% ад масы каўчуку) ці іх наносяць на паверхню вырабу.

**АНТЫАКСІДА́НТЫ**, антыакіслялынікі, прыродныя ці сінтэтычныя рэчывы, якія затрымліваюць акіслялыныя працэсы ў арган. рэчывах. Механізм дзеяння найб. пашыраных А. (*амінаў* араматычных, *фенолаў, нафтолаў, сульфідаў, фасфітаў*) заснаваны на іх уласцівасці абрываць *ланцуговую хімічную рэакцыю* акіслення ў выніку ўзаемадзеяння з актыўнымі радыкаламі і прамежкавымі прадуктамі. Прадухіляюць, напр., старэнне палімераў, асманенне паліва, прагарканне тлушчаў і інш. Некаторым А. уласцівы *сінергізм*.

Прыродныя А. — вітаміны Е, выкарыстоўваюцца ў харч. прам-сці.

**АНТЫА́РХІ** (Antiarchi), падклас вымерлых панцырных рыб кл. пласцінаскурых. Вядомы з сярэдняга і позняга дэвону ўсіх мацерыкоў. 2 атрады. Жылі ў прэсных і саленаватых вадаёмах. Тыповыя прадстаўнікі А. — батрыялепісы (Bothriolepis). На Беларусі рэшткі А. выяўлены ў Аршанскай і Прыпяцкай упадзінах у пясчана-гліністых і гліністакарбанатных пародах сярэдняга дэвону.

Даўж. да 1 м. Адрозніваюцца ад прадстаўнікоў падкл. *артрадыраў* размяшчэннем пласцінак панцыра. Частка тулава, галавы і грудных плаўнікоў укрыта касцявым панцырам, хваставая — луской. Збліжаныя вочы размяшчаліся ў агульнай арбіце на спінным баку галаўнога панцыра. Сківіцы слабыя, у выглядзе 2 пар тонкіх пласцінак, 1—2 спінныя плаўнікі, хваставы — гетэрацэркальны. Прыродныя бентафагі.

**АНТЫ́Б** (Antibes), кліматычны курорт у Францыі. На У ад Канаў, на ўзбярэжжы Міжземнага мора, каля падножжа Прыморскіх Альпаў. Развіваецца з пач. 20 ст. Субтрапічны клімат з гарачым сухім летам і мяккай вільготнай зімой, хваёвыя лясы, пясчаны пляж спрыяльныя для адпачынку і лячэння агульнасаматычных хвароб. Буйны цэнтр маст. керамікі, кветкаводства і міжнар. турызму. Музеі, бат. сад, цэнтр зімовага спорту.

**АНТЫБА́КХІЙ** (грэч. antibakcheios), у *антычным вершаскладанні* стапа з 3 складоў — 2 доўгіх і 1 кароткага.

**АНТЫБІЁТЫКІ** (ад *анты...* + грэч. bios жыццё), арганічныя рэчывы, што ўтвараюцца ў мікраарганізмах і ў невял. дозах прыгнечваюць жыццядзейнасць інш. мікраарганізмаў, вірусаў і клетак. Да А. адносяць таксама раслінныя (*фітанцыды*) і жывёльнага паходжання рэчывы з антымікробным дзеяннем. Вядома каля 4 тыс. А., у мед. практыцы выкарыстоўваецца каля 60 (першы клінічна эфектыўны А. *пеніцылін* адкрыты англ. мікрабіёлагам А.Флемінгам у 1929).

Паводле хім. прыроды А. належаць да розных груп злучэнняў: вугляродзмяшчальныя (неаміцын, канаміцын, стрэптаміцын, амінагліказіды і інш., А. групы рыстаміцыну — ванкаміцын), макрацыклічныя лактоны (эрытраміцын, алеандаміцын, паліены), хіноны і блізкія да іх рэчывы (тэтрацыкліны, антрацыкліны), пептыды і пепталіды (пеніцыліны, інтэрферон, граміцыдзін С, актынаміцыны) і інш. Паводле механізма дзеяння адрозніваюць А., якія парушаюць сінтэз клетачных абалонак бактэрый (пеніцыліны і інш.), бялкоў (тэтрацыкліны, хлорамфенікол і інш.), нукleінавых кіслот (проціпухлінныя А. — аліваміцын, рубаміцын, кармінаміцын і інш.), разбураюць цэласнасць цытаплазматычных мембран (паліены) і біяэнергет. працэсаў (граміцыдзін С). А. могуць мець шырокі спектр дзеяння (уплываюць на грамдадатныя і грамадмоўныя бактэрыі, напр. тэтрацыкліны) і вузкі (актыўныя пераважна да грамдадатных мікробаў, напр. пеніцылін, рыфаміцын).



Антыарха.

На лек. і гасп. мэты А. атрымліваюць

гал. чынам мікрабіял. сінтэзам на аснове бактэрый і мікраскапічных грыбкоў (пераважна актынаміцэтаў), частку — хім. сінтэзам або хім. мадыфікацыяй прыродных А. Выкарыстоўваюць на лячэнне інфекц. хвароб чалавека, жывёл і раслін, для паскарэння росту і развіцця маладняку, як кансерванты, пры вывучэнні тонкіх механізмаў біяхім. пераўтварэнняў, праблем анкалогіі і функцыянавання жывых клетак.

*Літ.*: Молекулярные основы действия антибиотиков: Пер. с англ. М., 1975; Handbook of Antibiotic Compounds. Vol. 1—7. Boca—Batom, 1980—81.

**АНТЫВАЕ́ННЫ РУХ**, гл. ў арт. *Пацыфізм*.

**АНТЫВІТАМІ́НЫ** (ад *анты...* + *вітаміны*), рэчывы з ліку *антыметабалітаў*, якім уласціва біял. дзеянне, процілеглае дзеянню *вітамінаў*. Хім. будовай звычайна блізкія да вітамінаў або з'яўляюцца іх вытворнымі (напр., А. вітаміну $B_1$ — пірытыямін), таму канкурэнтна лёгка замяшчаюць вітаміны ў біяхім. рэакцыях і парушаюць працэсы абмену рэчываў. Да А. належаць таксама інш. рэчывы, што ў жывых клетках звязваюць вітаміны, пераводзяць у неактыўную форму або разбураюць іх (напр., тыяміназа, авідзін, некаторыя лекавыя сродкі — антыбіётыкі, сульфаніламіды). Вынікам насычэння арганізма А. можа быць вітамінная недастатковасць, якая развіваецца нават пры дастатковым паступленні вітамінаў з ежай або ўтварэнні іх у арганізме.

**АНТЫГАНІ́ДЫ**, дынастыя цароў Македоніі ў 306—168 да н.э. Заснавальнік Антыгон I Аднавокі [306—301] — палкаводзец Аляксандра Македонскага; абвясціў царом сябе і свайго сына Дэметрыя I Паліяркета [306—286]. Найб. вядомыя прадстаўнікі: Антыгон II Гонат [283—239], Дэметрый II [239—229], Антыгон III Досан [229—221], Філіп V [221—179]. Апошні з А. Персей скінуты рымлянамі і ўзяты ў палон у 168 да н.э.

**АНТЫГАРМО́НЫ** (ад *анты...* + *гармоны*), прыродныя ці штучна сінтэзаваныя рэчывы, здольныя замяшчаць і блакіраваць актыўнасць сапраўдных гармонаў у іх рэакцыях з рэцэптарамі жывых клетак. Структурна блізкія да адпаведных ім гармонаў і належаць да розных груп злучэнняў (пептыды, бялкі, стэроіды і інш.), але ў дачыненні да кожнага канкрэтнага гармону пераважае пэўны іх клас (напр., большасць А. для антыандрагенаў з'яўляюцца стэроідамі, для бялковых гармонаў — бялкамі). Валодаюць высокай спецыфічнасцю: напр., антыэстрагены блакіруюць у матцы дзяленне толькі эстрагенаў і не змяняюць уплыў андрагенаў. Пры гэтым уласная гарманальная актыўнасць у А. адсутнічае або нязначная. Выкарыстоўваюцца ў эксперым. і клінічнай эндакрыналогіі для вывучэння функцый эндакрынных залоз у эмбрыягенезе, выключэння іх дзейнасці без хірург. выдалення адпаведнай залозы, блакіравання гарманальных эфектаў пры развіцці гарманальназалежных пухлін, паталагічных зменах палавых паводзін і інш.

**АНТЫГЕЛЬМІ́НТЫКІ**, антыгельмінтныя сродкі, процігліснымі сродкі, лекавыя сродкі, якія выкарыстоўваюцца для лячэння *гельмінтозаў*. Бываюць прыроднага паходжання (цытвора, экстракт мужчынскай папараці) і сінтэтычныя (хлаксіл, дытразін і інш.). Вынішчаюць гельмінтаў, разбураючы покрывы іх цела (фенасал, гептылрэзарцын), або ўздзейнічаюць на нерв.-мышачную сістэму, прыгнечваюць рухальную актыўнасць паразітаў і забяспечваюць выдаленне іх з арганізма (сантанін, дытразін, піперазін, нафтамон і інш.).

**АНТЫГЕ́НЫ** [ад *анты...* + *ген*(ы)], складаныя арган. рэчывы, якія пры паступленні ў арганізм чалавека і цеплакроўных жывёл выклікаюць спецыфічную імунную рэакцыю — утварэнне

**Антыгона.** Фрагмент размалёўкі апулійскай амфары. 4 ст. да н.э.

*антыцелаў*. Уласцівасцямі А. валодаюць чужародныя для дадзенага арганізма бялкі і поліцукрыды, асабліва высокамалекулярныя. Як А. яны могуць быць агульныя для ўсіх асобін пэўнага віду арганізмаў (відавыя А.) або толькі для іх часткі (групавыя А.). Ступень імунагеннасці А., форма і вынік імуннага адказу, які яны выклікаюць (утварэнне антыцелаў, клетачны імунітэт, алергія, талерантнасць), залежаць ад ступені іх чужароднасці (філагенетычнай аддаленасці), хім. прыроды і малекулярнай будовы, дозы і формы ўвядзення ў арганізм і інш. фактараў. Імунная сістэма млекакормячых здольная распазнаваць да $10^6$ А. Вызначэнне відавой і групавой прыналежнасці А. выкарыстоўваецца пры ўстанаўленні ступені роднасці арганізмаў, распрацоўцы вакцын і сываратак, перапераліванні крыві, перасадках тканак, дыягностыцы хвароб, у суд. медыцыне і інш.

**АНТЫГІ́ТЛЕРАЎСКАЯ КААЛІ́ЦЫЯ**, саюз дзяржаў і народаў, якія змагаліся ў *другой сусветнай вайне 1939—45* супраць агрэсіўнага блока гітлераўскай Германіі, Італіі, Японіі і іх сатэлітаў. Аснову кааліцыі складалі вял. дзяржавы — Савецкі Саюз (адыграў вырашальную ролю ў дасягненні перамогі), ЗША, Англія, Францыя, Кітай. У ваен. дзеяннях на баку А.к. прымалі ўдзел Польшча, Чэхаславакія, Югаславія, Аўстралія, Бельгія, Бразілія, Індыя, Канада, Філіпіны, Эфіопія і інш. Асобныя дзяржавы дапамагалі А.к. пастаўкамі ваен. сыравіны (напр., Мексіка). Былі і такія краіны, што аб'явілі вайну Германіі толькі напярэдадні яе разгрому і не зрабілі якога-небудзь укладу ў перамогу. На момант сканчэння 2-й сусв. вайны А.к. аб'ядноўвала больш за 50 дзяржаў, прычым вайну Германіі аб'явілі і яе былыя саюзнікі Балгарыя, Венгрыя, Італія і Румынія. Дапамогу А.к. аказаў народны *Рух Супраціўлення*, які разгарнуўся ў многіх акупіраваных краінах. У ліку паўнапраўных дзяржаў А.к. былі Беларусь і Украіна (будучыя члены — заснавальнікі ААН), а таксама іншыя былыя саюзныя рэспублікі СССР.

Пачатак утварэнню А.к. пакладзены заявамі аб узаемнай падтрымцы ўрадаў СССР, ЗША і Англіі пасля нападу фаш. Германіі на СССР, англа-сав. і сав.-амер. перагаворамі летам 1941, падпісаннем 12.7.1941 сав.-англ. пагаднення аб сумесных дзеяннях у вайне супраць Германіі, Маскоўскай нарадай 1941 трох дзяржаў (гл. *Маскоўскія нарады 1941, 1943, 1945*), а таксама шэрагам інш. пагадненняў паміж саюзнікамі. 1.1.1942 у Вашынгтоне падпісана Дэкларацыя 26 дзяржаў (Дэкларацыя Аб'яднаных Нацый), якія знаходзіліся на той час у стане вайны з Германіяй, Італіяй, Японіяй і іх саюзнікамі. У Дэкларацыі гаварылася, што дзяржавы А.к. абавязаны выкарыстоўваць свае ваен. і эканам. рэсурсы для барацьбы супраць фаш. дзяржаў і не заключаць з імі сепаратных дагавораў. Пазней дзяржавы А.к. падпісалі шэраг дакументаў, сярод якіх найбольшае значэнне маюць пастановы Тэгеранскай (1943), Крымскай і Патсдамскай (абедзве 1945) канферэнцый (пра ўсе гл. асобныя арт.) кіраўнікоў урадаў СССР, ЗША і Вялікабрытаніі. А.к. ў цэлым вырашыла задачы, што стаялі перад ёю ў 2-й сусв. вайне, і стала асновай для ўтварэння *Арганізацыі Аб'яднаных Нацый*.

**АНТЫГО́НА**, у грэчаскай міфалогіі дачка фіванскага цара *Эдыпа*. Не пакінула сляпога бацьку і ў выгнанні. Пасля яго смерці вярнулася ў Фівы і насуперак забароне дзядзькі — цара Крэонта, пахавала брата Палініка, які загінуў у барацьбе за ўладу ў Фівах. За гэта была жывая замуравана ў каменную пя-

чору, дзе скончыла самагубствам. Міф пра А. выкарысталі ў л-ры Сафокл, Ж.Расін, Б.Брэхт, у музыцы К.В.Глюк, Ф.Мендэльсон, К.Сен-Санс і інш.

**АНТЫ́ГУА** (Antigua), каралавы востраў у Вест-Індыі, у групе Наветраных а-воў (архіпелаг М.Антыльскія а-вы). Тэр. дзяржавы *Антыгуа і Барбуда*. Пл. 280 км². Выш. да 402 м. Клімат трапічны, пасатны, гарачы. Ападкаў каля 1300 мм за год. Адкрыты Х.Калумбам (1493).

**АНТЫ́ГУА І БАРБУ́ДА** (Antigua and Barbuda), дзяржава ў Вест-Індыі, на а-вах Антыгуа, Барбуда і Рэдонда ў групе М.Антыльскіх а-воў у Карыбскім моры. Пл. 442,6 км². Нас. 65 тыс. чал. (1993), у асн. негры. Афіц. мова — англійская. Большасць вернікаў — пратэстанты (англіканская царква). Сталіца — горад і порт Сент-Джонс (на в-ве Антыгуа).

Герб і сцяг Антыгуа і Барбуда.

Падзяляецца на 7 раёнаў. Кіраўнік дзяржавы фармальна — брыт. манарх, прадстаўлены ген.-губернатарам. Двухпалатны парламент (палата прадстаўнікоў і сенат) ажыццяўляе заканад. ўладу. Урад узначальвае прэм'ер-міністр, якога прызначае ген.-губернатар.

**Прырода**. Астравы складзены пераважна з каралавых вапнякоў. Паверхня ўзгорыстая, выш. да 402 м (в-аў Антыгуа). Клімат трапічны пасатны, гарачы. Сярэднямесячная т-ра ад 15 да 33 °С. Ападкаў каля 1300 мм за год. Восенню характэрны ўраганы. Адносная раўнінасць, адсутнасць рачной сеткі і недастатковасць ападкаў выклікаюць перыяд. засухі. Вострай з'яўляецца праблема прэснай вады (атрымліваюць з артэзіянскіх калодзежаў).

**Гісторыя**. Старажытныя насельнікі А. і Б. — індзейцы. Пасля адкрыцця астравоў Х.Калумбам (1493) тут з'явіліся іспан. каланізатары. Потым Барбуда (у 1628) і Антыгуа (у 1632) каланізаваны англ. пасяленцамі. На кароткі час астравы трапілі пад уладу Францыі, з 1667 сталі брыт. калоніяй. Пасля вынішчэння карэннага насельніцтва на іх пасялілі нявольнікаў-неграў з Афрыкі, якіх прымушалі працаваць на плантацыях цукр. трыснягу. У 1834 рабства адменена. У 1871—1956 тэр. А. і Б. — частка брыт. калоніі «Федэрацыя Падветраных астравоў»; у 1958—62 уваходзіла ў Вест-Індскую федэрацыю. У 1967 А. і Б. атрымалі аўтаномію як «асацыіраваная з Вялікабрытаніяй дзяржава»; 1.11.1981 абвешчана іх незалежнасць. У 1981 краіна ўступіла ў ААН, Арг-цыю Амер. Дзяржаў, у 1982 — у Карыбскае супольніцтва, з 1983 мае статус назіральніка ў Руху недалучэння. Дзейнічаюць Лейбарыстская партыя Антыгуа (створана пасля 1940), Аб'яднаная прагрэсіўная партыя (з 1992).

**Гаспадарка** арыентавана на турызм, які забяспечвае 60% валавога ўнутр.

прадукту (ВУП; 424 млн. дол., 1991), 70% занятасці насельніцтва і валютных паступленняў (1990). Сельская гаспадарка (вырошчванне цукр. трыснягу, бананаў, какосавых арэхаў, манга, цытрусавых і інш.) дае 4% ВУП, прам-сць (вытв-сць цукру, какосавага і бавоўнавага алею, зборка быт. электратэхнікі, нафтаперапрацоўка) — 5%, транспарт і сфера паслуг — 8%. Даўж. аўтадарог 548 км, вузкакалейнай чыгункі каля 80 км. Экспарт: нафтапрадукты, трансп. абсталяванне, цукар-сырэц, патака-мелес, бавоўна-сырэц, цытрусавыя. Імпарт: паліва, прадукты харчавання, тэкст. тавары, піламатэрыялы і інш. Гал. знешнегандл. партнёры — Вялікабрытанія, ЗША, Канада, Японія, КНР, карыбскія і зах.-еўрап. краіны. Грашовая адзінка — усх.-карыбскі долар. *Ф.С.Фешчанка* (гаспадарка).

**АНТЫДАРВІ́НІЗМ**, тэорыі, накіраваныя супраць *дарвінізму*. А. або наогул адмаўляе развіццё ў прыродзе (*крэацыянізм*), або яго гал. фактары, у першую чаргу натуральны адбор як вядучы ў арган. эвалюцыі. Асн. цячэнні А. склаліся ў 2-й пал. 19 — пач. 20 ст. Да іх належаць розныя формы *неаламаркізму*, *батмагенез*, *номагенез*, *трансфармізм* і інш. Сучасныя антыдарвінісцкія канцэпцыі звычайна прэтэндуюць на вырашэнне праблемы макраэвалюцыі, недаступнай для прамой эксперым. праверкі. Шэраг канцэпцый А. ўключае ўяўленні аб наследаванні набытых прыкмет і інш.

**АНТЫДО́ТЫ** (грэч. antidoton літар. які даецца супраць), п р а ц і я д д з е, лекавыя сродкі пры атручэнні ядамі, таксінамі, атрутнымі рэчывамі (АР); спецыфічныя прафілактычныя сродкі. А. дзейнічаюць па-рознаму: прадухіляюць паступленне АР, таксінаў, ядаў у кроў; абумоўліваюць дэтаксікацыю ядаў у арганізме; забяспечваюць папаўненне біятенных рэчываў, якія страчаны пры хранічных інтаксікацыях; спрыяюць вывядзенню ядаў ці таксінаў з арганізма. Раслінныя А. надаюць устойлівасць раслінам да гербіцыдаў і павялічваюць выбіральнасць і эфектыўнасць апошніх.

**АНТЫДЫУРЭТЫ́ЧНЫ ГАРМО́Н**, гл. *Вазапрэсін*.

**АНТЫДЭПРЭСА́НТЫ** (ад *анты...* + лац. depressio прыгнечанасць), лекавыя *псіхатропныя сродкі* для папярэджання або нейтралізацыі псіхічных і фіз. расстройстваў, якія суправаджаюць стан *дэпрэсіі*. Паляпшаюць настрой, здымаюць трывогу і напружанасць, павышаюць псіхічную актыўнасць, нармалізуюць агульны тонус, сон, страваванне, рухомасць арганізма. Многія з іх несумяшчальныя з асобнымі відамі ежы, асабліва з ужываннем у час лячэння спіртных напіткаў (магчыма развіццё калапсу). Асобныя А. на пач. этапе выкарыстання запавольваюць скорасць рэакцыі і ўспрымання сітуацый, таму пры назначэнні выключаюць магчымасць кіравання трансп. сродкамі або выканання складаных тэхн. аперацый.

**АНТЫДЭТАНА́ТАР**, хімічнае злучэнне, якое дабаўляюць у маторнае паліва для прадухілення яго дэтанацыі ў цыліндрах рухавікоў. Найб. пашыраны тэтраэтылсвінец (ТЭС — «этылавая вадкасць»), яго канцэнтрацыя ў паліве менш за 1%. Маторнае паліва з ТЭС (этыліраванае) таксічнае, пры рабоце з ім патрэбны меры перасцярогі.

**АНТЫЁХ III** В я л і к і (грэч. Antiochos Megas; 242—187 да н.э.), цар дзяржавы *Селеўкідаў* [223—187], праўнук Селеўка I. У 212—205 падпарадкаваў парфян і Бактрыю, у 203 адваяваў у Егіпта Палесціну. Пацярпеўшы паражэнне ад Рыма ў Сірыйскай вайне 192—188, заключыў мір, т.зв. Апамейскі дагавор 188, пасля якога Селеўкідскае царства стала другараднай дзяржавай. Забіты ў Элімаідзе ў час рабавання яго войскамі храма бога Бэла.

**АНТЫЦЭА́Л**, уяўленні аб чалавеку і яго дзейнасці, аб адносінах паміж людзьмі і арганізацыі грамадства, якія супрацьлеглыя поглядам на дасканалае; процілеглы *ідэалу*. А. мае элемент адноснасці. Тое, што разглядаецца як А. аднымі людзьмі і сац. групамі, членамі пэўнага грамадства або людзьмі пэўнай эпохі, можа ўспрымацца як ідэал іншымі, і наадварот. Так, сталінізм і фашызм — А. для людзей з дэмакр. мысленнем і ідэалы — для людзей з таталітарнымі ўстаноўкамі. Ёсць А. рэалістычныя (паддаюцца ажыццяўленню) і абсалютныя (не могуць быць дасягнуты ў рэчаіснасці — *антыутопія*). А. — неабходная форма мыслення. Разам з ідэалам А. выконвае рэгулятыўную функцыю ў дзейнасці людзей, у т.л. і ў кіраванні грамадскімі працэсамі.

*Г.А.Антанюк.*

**АНТЫКААГУЛЯ́НТЫ** [ад *анты...* + лац. coagulans (coagulantis) які вядзе да згусання] у медыцыне, лекавыя сродкі, якія памяншаюць скорасць згусання крыві і перашкаджаюць утварэнню *тромбаў*. Уплыў А. прамога дзеяння (гепарын, гірудзін і інш.) адбываецца праз зніжэнне актыўнасці трамбіну ў крыві, А. ўскоснага дзеяння (дыкумарын, пелентан, фенілін і інш.) — праз парушэнне працэсаў утварэння трамбіну ў печані. Выкарыстоўваюцца пры інфарктах, тромбафлебітах, трамбатычных і эмбалічных інсультах, пасля хірург. ўмяшання і інш. Проціпаказаны пры цяжарнасці, язвавай і нырачна-камянёвай хваробах, схільнасці да крывацёкаў.

**АНТЫКАДО́Н** (ад *анты...* + *кадон*), участак малекулы транспартнай рыбануклеінавай кіслаты (тРНК). Складаецца з трох *нуклеатыдаў*, якія маюць незамешчаныя вадародныя сувязі. А. камплементарны адпаведнаму кадону матрычнай рыбануклеінавай кіслаты (мРНК) і таму спецыфічна звязваецца з ім. Узаемадзеянне кадон — А., што адбываецца на рыбасомах у працэсе трансляцыі, забяспечвае правільнае размяшчэнне кожнай амінакіслаты ў поліпептыдным ланцугу пры біясінтэзе бялку.

**«АНТЫКАМІНТЭ́РНАЎСКІ ПАКТ»**, дагавор паміж Германіяй і Японіяй, заключаны 25.11.1936 у Берліне на 5 гадоў. Пад знакам барацьбы з Камінтэрнам аформіў блок 2 дзяржаў, якія імкнуліся да гегемоніі ў свеце. Сакрэтнае пагадненне да «А.п.» прадугледжвала сумесную барацьбу супраць СССР. Да «А.п.» далучыліся Італія (6.11.1937), Венгрыя і марыянетачная «дзяржава» Маньчжоў-Го (24.2.1939), Іспанія (27.3.1939). Пакт садзейнічаў развязванню 2-й сусв. вайны і ў 1939—40 ператварыўся ў адкрыты ваен. саюз Германіі, Італіі і Японіі (гл. *Берлінскі пакт 1940*). Пасля пралангацыі пакта 25.11.1941 на 5 гадоў да яго далучыліся яшчэ некалькі краін. Перамога краін *Антыгітлераўскай кааліцыі* ў 2-й сусв. вайне спыніла існаванне «А.п.».

**АНТЫКАРАЗІ́ЙНЫЯ ПАКРЫ́ЦЦІ**, пакрыцці для аховы паверхні металічных вырабаў ад карозіі. Найб. пашыраныя А.п.: з металаў (хрому, цынку, нікелю, высакародных металаў і інш.) і іх сплаваў; з хім. злучэнняў металаў (аксіды, карбіды, нітрыды, фтарыды і інш.); з палімерных (фторпластавыя, поліэтыленавыя, поліізабутыленавыя, полівінілхларыдныя) і лакафарбавых пакрыццяў, а таксама кансервацыйныя замазкі (напр., бітум). Эфектыўнасць А.п. вызначаецца хім. і фазавым саставам, дасканаласцю будовы, трываласцю счаплення пакрыцця з асновай матэрыялу.

А.п. бываюць анодныя ці катодныя адносна матэрыялу, які ахоўваюць. Анодныя змяншаюць, прадухіляюць карозію, катодныя могуць павялічваць яе, але пры гэтым паляпшаюць фіз.-мех. якасці матэрыялаў. А.п. наносяць фарбаваннем, гальванічным, плазмавым, вакуумным, іонна-плазмавым і электрафарэтычнымі метадамі, хім. асаджэннем з газавай фазы і растворaў, *плакіраваннем*. Выбар метаду залежыць ад патрэбнага спалучэння матэрыялаў пакрыцця і асновы, неабходнай таўшчыні пакрыцця, магчымасці і неабходнасці яго аднаўлення ў эксплуатацыі. На Беларусі стварэннем А.п. займаюцца Бел. навукова-вытв. аб'яднанне парашковай металургіі, Бел. політэхн. акадэмія, Ін-т механікі металапалімерных сістэм АН Беларусі.

*А.У.Белы.*




Антыкліналь (*а*) і сінкліналь (*б*); 1 — крыло складкі; 2 — ядро складкі.

**АНТЫКВА́Р** (ад лац. antiquarius аматар, знаўца старажытнасцяў), збіральнік і прадавец стараж. прадметаў, твораў мастацтва, рэдкіх кніг і інш. рэчаў.

**АНТЫКЛІНА́ЛЬ** (ад *анты...* + грэч. klinō нахіляю), антыклінальная складка, складка пластоў горных парод, павернутая пукатасцю ўгару, з больш стараж. пародамі ў ядры. Найб. уласцівыя складкавым горным сістэмам Зямлі. Бывае прамая, нахіленая, ляжачая, перакуленая. Месца перагіну пластоў наз. замком А. (скляпеннем), бакі — крыламі. А., у якіх адносіны шырыні да даўжыні складаюць 1/3, наз. *брахіантыкліналямі*, круглаватыя ў плане А. — купаламі. На Беларусі пашыраны ў пародах крышт. фундамента (Ваўкавыская, Івацэвіцка-Вілейская, Пружана-Ашмянская) і платформавага чахла, пераважна ў дэвонскіх салянасных, подсцільных і перакрываючых іх адкладах Прыпяцкага прагіну (Васілевіцкая, Мышанская, Старобінская і інш.), дзе ўзніклі ў выніку разломных і галакінетычных рухаў у познім палеазоі і мезазоі.

*М.А.Нагорны.*

**АНТЫКЛІНО́РЫЙ** (ад *антыкліналь* + грэч. oros гара), буйны комплекс складкавых структур зямной кары, які ўзнік у *геасінкліналях*. Характэрны агульны ўздым і заляганне найб. стараж. парод у цэнтр. частцы, форма выцягнутага скляпення. Восевыя плоскасці складак А. часта размешчаны веерападобна і нахілены ад цэнтра да перыферыі. Мае сотні кіламетраў у даўжыню і дзесяткі ў шырыню (В.Каўказ, Уралтау і інш.).

*М.А.Нагорны.*

**АНТЫКО́СТЫ** (Anticosti), востраў у заліве Св. Лаўрэнція, тэр. Канады. Пл. 7,9 тыс. км². Раўнінны (выш. да 192 м), укрыты цемнахвойнай тайгой, балотамі. Порт — Пор-Менье.

**АНТЫЛАГІ́ЗМ** (ад *анты...* + грэч. logos розум), формула логікі, якая адлюстроўвае несумяшчальнасць пасылак катэгарычнага *сілагізму* з адмаўленнем яго заключэння. У аснове А. ляжаць законы лагічнага вываду, паводле якіх вынік не можа быць памылковым, калі пасылкі праўдзівыя. Тэорыя А. — адзін з варыянтаў *сілагістыкі*.

**АНТЫЛІВА́Н**, Джэбель-эш-Шаркі, платопадобны горны масіў у Сірыі і Ліване. Даўж. каля 100 км. Выш. да 2814 м (г. Эш-Шэйх). Складзены пераважна з вапнякоў і пясчанікаў. На стромкіх зах. схілах, павернутых да ўпадзіны Бекаа, пашыраны міжземнаморскія лясы і вечназялёныя хмызнякі, на ўсходніх — паўпустыні. Праз А. праходзіць аўтамаб. шаша і чыгунка Дамаск—Бейрут.

**АНТЫЛО́ПЫ**, групы жывёл атр. парнакапытных сям. пустарогіх за выключэннем быкоў, буйвалаў, казлоў і бараноў. Пашыраны ў Афрыцы, Еўразіі, Паўн. Амерыцы. 30 родаў, каля 80 відаў. Да роду А. (Antilope) належыць толькі індыйская А. гарна. У стэпах і саваннах Афрыкі жывуць буйныя каровіны А. — *гну* і бубалы, горная А. (Hippotragus niger). Паўпустыні і пустыні Афрыкі насяляюць конскія А. (Hippotragus), *арыксы*, адакс (Addax nasomaculatus). У пустынях, стэпах і лесастэпах Афрыкі і Азіі жывуць *газелі*, да якіх належаць *джэйран* і *дзерэн*. Спосаб жыцця стадны. Многія занесены ў Чырв. кнігу МСАП.

Выш. ў карку ад 25 см (карлікавыя А. — Neotraginae) да 180 см (А. Кана — Taurotragus oryx), маса ад 8 кг да 1000 кг. Рогі прамыя і кароткія (ад 1,5 см) або доўгія (да 150 см) і выгнутыя ў выглядзе дугі або штопара. Афарбоўка ад светлай жоўта-пясчанай да шэра-блакітнай або амаль чорнай. Нараджаюць 1—3 цялят. Кормяцца травяністай расліннасцю, радзей лісцем дрэў. Аб'екты палявання; выкарыстоўваюцца мяса, скура, рогі.

**АНТЫ́ЛЬСКАЕ ЦЯЧЭ́ННЕ**, цёплае паверхневае цячэнне Атлантычнага ак., на

ПнУ ад В. Антыльскіх а-воў. Т-ра вады ў лютым 25, у жн. 28 °С. Скорасць 0,9—1,8 км/гадз. Абмываюе Антыльскія і Багамскія а-вы, ад в-ва Пуэрта-Рыка з'яўляецца працягам *Паўночнага Пасатнага цячэння*, на Пн злучаецца з цячэннем *Гальфстрым*.

**АНТЫ́ЛЬСКІЯ АСТРАВЫ́** (ісп. Antillas), архіпелаг у Атлантычным ак. паміж Паўн. і Паўд. Амерыкай (Вест-Індыя). Падзяляецца на *Вялікія Антыльскія астравы* і *Малыя Антыльскія астравы*. Пл. 220 тыс. км². А.а. мацерыкавага і вулканічнага паходжання, паверхня б.ч. гарыстая (найвыш. г. Дуартэ, 3175 м, на в-ве Гаіці), характэрна моцная сейсмічнасць (акрама раўнінай ч. Кубы). Клімат трапічны вільготны. Расліннасць — саванна, захаваліся ўчасткі лістападных і вечназялёных лясоў і хмызнякоў. Жывёльны свет: грызуны, лятучыя мышы, з паўзуноў кракадзілы, яшчаркі, змеі. На А.а. дзяржавы Антыгуа і Барбуда, Барбадос, Гаіці, Грэнада, Дамініка, Дамініканская Рэспубліка, Куба, Сент-Вінсент і Грэнадзіны, Сент-Кітс і Невіс, Сент-Люсія, Трынідат і Табага, Ямайка, а таксама ўладанні ЗША, Вялікабрытаніі, Францыі, Нідэрландаў, ч. тэр. Венесуэлы.

**АНТЫМАНІ́Т** (ад позналац. antimonium сурма), сурмяны бліскучак, стыбніт, мінерал класа сульфідаў $Sb_2S_3$. Мае 71,4—71,8% сурмы. Крышталізуецца ў рамбічнай сінганіі. Утварае прызматычныя, ігольчастыя крышталі, суцэльныя, зярністыя, радыяльна-прамяністыя агрэгаты. Колер свінцова-шэры да чорнага. Бляск металічны. Цв. 2—2,5. Шчыльн. 4,5—4,6 г/см³. Паходжанне гідратэрмальнае, радзей у свінцова-цынкавых радовішчах і інш. Галоўная руда сурмы.

**АНТЫМЕТАБАЛІ́ТЫ**, прыродныя або сінтэтычныя біялагічна актыўныя рэчывы, па хім. прыродзе блізкія да звычайных прадуктаў абмену рэчываў (*метабалітаў*) арганізма і здольныя ўступаць з імі ў канкурэнтныя, антаганістычныя адносіны. Да важнейшых А. належаць *антывітаміны, антыгармоны, антыферменты*. Структурныя аналагі адпаведных вітамінаў, гармонаў, ферментаў, медыятараў і інш., якія ў біяхім. рэакцыях займаюць іх месца або блакіруюць пэўныя рэцэптары і тым змяняюць цячэнне важных фізіял. працэсаў. Пры пэўных умовах А. могуць не толькі парушаць, але і нармалізаваць біяхім. працэсы, таму выкарыстоўваюцца для лячэння некаторых хвароб (у першую чаргу выкліканых парушэннямі абмену рэчываў).

**АНТЫМУТАГЕ́НЫ** (ад *анты...* + *мутагены*), хімічныя і фізічныя фактары, здольныя паніжаць або прадухіляць дзеянне мутагенаў, у выніку чаго змяншаецца частата мутацый.

Адкрыты ў 1950-я г. Натуральныя А. забяспечваюць захаванне пэўнага ўзроўню спантанных мутацый. Сярод іх важнейшымі з'яўляюцца некаторыя ферментныя сістэмы і метабаліты, якія «выпраўляюць» пашкоджанні, выкліканыя мутагенам участкі храмасом або перашкаджаюць іх узнікненню. Пры штучным *мутагенезе* мутацыйны эфект можа быць паніжаны або зняты радыепратэктарамі (сульфгідрыльныя злучэнні, моцныя аднаўляльнікі тыпу $Na_2S_2O_3$, некаторыя спірты і вугляводы, некаторыя солі) або ўздзеяннем некаторых фіз. фактараў (святло, т-ра, ультрафіялетавыя прамяні) рознай інтэнсіўнасці.

**АНТЫНЕЙТРО́Н** ($\bar{n}$ або $\tilde{n}$), *антычасціца* нейтрона, якая адрозніваецца ад яго знакамі *барыённага зараду* і *магнітнага моманту*. Зарэгістраваны ў 1956 амер. вучонымі пры рассейванні пучка *антыпратонаў* у рэчыве.

**АНТЫНЕЙТРЫ́НА** ($\bar{\nu}$ або $\tilde{\nu}$), антычасціца нейтрына, якая адрозніваецца ад яго знакам лептоннага зараду і спіральнасцю. Мае спін 1/2 і масу такую ж, як і маса *нейтрына*. Існуюць 3 тыпы А.: электроннае, мюоннае і таўоннае, якія ўдзельнічаюць у працэсах слабага ўзаемадзеяння разам з *электронам, мюонам* і цяжкім *лептонам* адпаведна.

**АНТЫНО́Й** (лац. Antinous; каля 110, Віфінія — 130), грэчаскі юнак, любімец рым. імператара *Адрыяна*. Патануў у Ніле (магчыма, прынёс сябе ў ахвяру), пасля чаго быў абагатвораны. На месцы гібелі А. засн. г. Антынопаль, пабудаваны храм, у яго гонар створаны шматлікія статуі і гемы, выпушчаны манеты.

**АНТЫНО́МІЯ** (ад грэч. antinomia супярэчнасць у законе), супярэчнасць паміж двума суджэннямі, кожнае з якіх аднолькава лагічна даказальнае. Паняцце «А.» ўзнікла ў антычнасці (Платон,

**Антылопы:** 1 — шаблярогі орыкс; 2 — адакс; 3 — орыкс; 4 — чорная; 5 — конская.

Арыстоцель). Стараж.-грэч. філосафы ў сэнсе А. часцей выкарыстоўвалі тэрмін «*апарыя*». Шмат увагі фармулёўцы і аналізу А. аддавалі схаластычныя логікі. Кант выкарыстоўваў паняцце «А.», спрабуючы апраўдаць асн. тэзіс сваёй філасофіі, паводле якога розум не можа выйсці за межы пачуццёвага вопыту і пазнаць «рэч у сабе». Вучэнне Канта пра А. развіта ням. класічным ідэалізмам як фундаментальная перадумова дыялект. логікі. Гегель крытычна прааналізаваў кантаўскае вырашэнне пытання А. і паказаў, што супярэчнасць — неад'емная аб'ектыўная характарыстыка духу, які знаходзіцца ў развіцці, гіст. быцця і мыслення. У дыялект. матэрыялізме А. разглядаецца ў рамках вучэння пра дыялект. супярэчнасці (адрозніваецца супярэчнасці ад *парадоксаў*). Пастаноўка навук. праблем у форме А. і іх вырашэнне — важнае звяно ў тэарэт. адлюстраванні дыялект. супярэчнасці аб'ектыўнай рэальнасці.

*Літ.*: Манеев А.К. Философский анализ антиномии науки. Мн., 1974.

**АНТЫПАСА́ТЫ** (ад *анты...* + *пасаты*), заходні перанос паветра ў трапасферы трапічных шырот над слоем усх. вятроў — *пасатаў*. Развіты на выш. 2—3 км каля тропікаў, да 10 км і больш (бліжэй да экватара). З'яўляюцца перыферыйнай часткай зах. пераносу паветра, які пануе ў верхняй трапасферы і ніжняй стратасферы Паўн. і Паўд. паўшар'яў зямнога шара.

**АНТЫПА́ТЫЯ** (грэч. antipatheia), пачуццё непрыязнасці, непрыхільнасці да каго-н. або чаго-н.; процілеглае — *сімпатыя*.

**АНТЫПЕДАГО́ГІКА**, плынь у педагогіцы, якая грунтуецца на адмаўленні выхавання як мэтанакіраванага працэсу фарміравання асобы. Узнікла ў 1970-я г. ў ЗША і краінах Зах. Еўропы. Яе тэарэтыкі [К.Берэйтэр (ЗША), М.Манані (Францыя), А.Мілер (Швейцарыя), Р.Шэрэр, Э. фон Браўнмюль, К.Рутчкі (ФРГ) і інш.] зыходзяць з культ.-антрапал. уяўленняў пра глыбокую раз'яднанасць пакаленняў як непазбежны вынік развіцця сучаснай цывілізацыі, паколькі дарослыя з прычыны хуткіх сац.-культ. змен не могуць перадаць дзецям той тып культуры, які стаў для моладзі рэальнай апорай у жыцці. Прадстаўнікі А. лічаць выхаванне сістэмай траўміруючага кантролю (а то і прамога гвалтавання) над асобай, яно выклікае патагенныя для самасвядомасці асобы працэсы, разбурае псіхічнае здароўе маладога пакалення, якому патрабаванні цывілізацыі не пад сілу. На іх думку, толькі спантаннае фарміраванне чалавека вядзе да гуманізацыі грамадства.

**АНТЫПЕРЫСТА́ЛЬТЫКА** (ад *анты...* + *перыстальтыка*), хвалепадобнае скарачэнне сценак полых трубчастых органаў (стрававальнага тракту, страўніка, мачаточнікаў і інш.) чалавека і жывёл, пры якім іх змесціва перамяшчаецца ў напрамку, адваротным звычайнаму. Фізіял. ўласцівасць тоўстых кішак. У тонкіх кішках, страўніку ў норме адсутнічае, узнікае пры рвоце і некаторых паталаг. з'явах.

**АНТЫПРАГЕ́НЫ** (ад *анты...* + грэч. pyr агонь + genos нараджэнне), рэчывы, якія прадухіляюць самазагаранне вугалю, рудаў, торфу і інш. Як А. выкарыстоўваюць ваду, сілікаты натрыю, плёнкаўтваральныя растворы, *інгібітары* акіслення і інш. Прызначаны для прадухілення пажараў у рудніках.

**АНТЫПІРЭ́НЫ** (ад *анты...* + грэч. pyr агонь), рэчывы або сумесі, якія зніжаюць гаручасць матэрыялаў арган. паходжання (драўніны, пластмасаў, тканін і інш.). Падзяляюцца на інертныя і актыўныя (уступаюць у хім. рэакцыю з матэрыяламі). Найб. пашыраны гідраксід алюмінію, злучэнні бору, фосфару (фасфаты), хлор- і бромвытворныя аліфатычных і араматычных вуглевадародаў. Выкарыстоўваюць як растворы для



Антыманіт.

прамочвання матэрыялаў, у саставе фарбаў.

**АНТЫПО́ДАЎ АСТРАВЫ́** (англ. Antipodes Islands), група скалістых астравоў у паўн. ч. Ціхага ак., Належаць Новай Зеландыі. Пл. 61 км². Выш. да 400 м. Назва абумоўлена іх месцазнаходжаннем амаль процілеглым Грынвічу (49°4' паўд. ш. і 178°43' усх. д.), ад якога вядзецца адлік мерыдыянаў.

**АНТЫПО́ДЫ** [ад *анты...* + грэч. pus (podos) нага], 1) жыхары дыяметральна процілеглых пунктаў на паверхні зямнога шара. У пераносным сэнсе — людзі з процілеглымі поглядамі, густамі або рысамі характару. 2) А. ў біялогіі — клеткі, размешчаныя ў процілеглым яйцаваму апарату (яйцаклеткі і сінергіды) краі *зародкавага мяшка* пакрытанасенных раслін. Колькасць іх ад 1 да 300 (часцей 3). Нярэдка А. моцна разрастаюцца і садзейнічаюць перадачы пажыўных рэчываў з тканак семязавязі зародку.

**АНТЫПРАТО́Н** ($\bar{p}$ або $\tilde{p}$), *антычасціца*, якая мае спін і масу, роўную спіну і масе пратона і адрозніваецца ад яго знакамі эл. зараду, *барыённага зараду* і *магнітнага моманту*. Адкрыты ў 1955 амер. вучонымі. Паводле закону захавання ліку барыёнаў, А. можа нарадзіцца толькі ў пары з пратонамі (ці нейтронам, калі дазваляе закон захавання эл. зараду) і пры яго сутыкненні з пратонамі і нейтронамі (нуклонамі) ядраў рэчыва адбываецца анігіляцыя і ўтвараюцца 4—5 пі-мезонаў.

**АНТЫРА́ДЫ**, від стабілізатараў палімераў, якія павышаюць стойкасць палімераў да дзеяння іанізавальных выпрамяненняў. Найб. эфектыўныя А.: *нафталін, антрацэн, фенантрэн, тыяфенолы, тыянафтолы* і інш. Прымаюць паглынутую палімерам энергію і рассейваюць яе ў выглядзе цяпла ці флуарэсцэнцыі. А. ўводзяць у палімер пры яго перапрацоўцы да 10% ад масы палімеру.

**«АНТЫРАМА́Н»**, гл. *«Новы раман»*.

**АНТЫРЫ́НУМ**, род кветкавых раслін, гл. *Львіны зеў*.

**АНТЫРЭ́ЧЫВА**, рэчыва, якое складаецца з *антычасціц*. Ядры атамаў А. складаюцца з антыпратонаў і антынейтронаў, абалонкі атамаў — з пазітронаў. Сутыкненне аб'ектаў з рэчыва і А. павінна прыводзіць да *анігіляцыі*, у выніку якой утвараецца жорсткае γ-выпрамяненне з энергіяй ≥ 70 МэВ. У 1965 амер. вучоныя пад кіраўніцтвам Л.Ледэрмана зарэгістравалі ўтварэнне ядраў антыдэйтэрыю, у 1970 сав. вучоныя пад кіраўніцтвам Ю.Д.Пракошкіна — ядры антыгелію-3. Значных назапашванняў А. ў Сусвеце пакуль не выяўлена, але касмалагічныя мадэлі Сусвету і яго ўтварэння не здымаюць пытання аб існаванні антырэчыва.

**АНТЫСЕЙСМІ́ЧНАЕ БУДАЎНІ́ЦТВА**, гл. *Сейсмаўстойлівае будаўніцтва*.

**АНТЫСЕМІТЫ́ЗМ**, праяўленне варожых адносін да яўрэяў (семітаў); адна з формаў нац. нецярпімасці, расізму і шавінізму. Гіст. карані А. ідуць ад часоў вымушанага масавага перасялення яўрэяў з Палесціны ў інш. краіны Рымскай імперыі (1 ст. н.э.), іх шматвяковых блуканняў па краінах Еўропы, дзе яны ўспрымаліся мясц. насельніцтвам як «іншароднае цела». У эпоху феадалізму ў Германіі, Аўстра-Венгрыі, Рас. імперыі яўрэі былі непаўнапраўнымі, падвяргаліся рэліг. і нац. ганенням, часта іх сялілі ў асобных, ізаляваных кварталах (гета). У выніку бурж. рэвалюцый гэтыя прававыя абмежаванні ў большасці краін зняты, але міфы пра «сусветную змову яўрэяў», іх вінаватасць у розных супярэчнасцях і няўстойлівасці жыцця перыядычна адраджаліся. Напр., у Расіі для яўрэяў у канцы 18 ст. была ўведзена *мяжа аселасці*, дзейнічалі законы, якія забаранялі ім купляць зямлю, паступаць на дзярж. службу, займаць афіцэрскія пасады ў арміі, служыць у паліцыі, працаваць на чыгунцы, у паштовых установах і інш. У 1880-я г. і ў перыяд рэвалюцыі

1905—07 па Расіі пракаціліся хвалі пагромаў, арганізатарамі якіх найчасцей выступалі паліт. паліцыя, шавіністычныя арг-цыі, аддз. чарнасоценнага «Саюза рускага народа» і інш. Асабліва жахлівыя формы набыў А. у фаш. Германіі і акупіраваных ёю краінах, калі гітлераўцы знішчылі каля 6 млн. яўрэяў, у т.л. 3 млн. грамадзян б. СССР. Палітыка дзярж. А. праводзілася пасля вайны і кіраўніцтвам СССР, сведчаннем чаго сталі кампаніі супраць т.зв. касмапалітаў (1949), «справа ўрачоў» (1953) і інш. У сучасных умовах праяўленні А. ёсць у ЗША (т.зв. «негрыцянскі А.»), Францыі (Ле Пен і яго аднадумцы), у асяроддзі арабскіх экстрэмістаў, у дзейнасці праварадыкальных нацыяналістычных арг-цый Расіі і інш. краін.

На Беларусі, дзе яўрэі пражывалі з 14—16 ст., антыяўрэйскія акцыі напачатку мелі эпізадычны характар, пазней праяўляліся ў выступленнях на соймах, у магістратах і цэхах з патрабаваннямі абмежавання яўрэяў у правах. Найбольш А. праявіўся напярэдадні і ў час рэвалюцыі 1905—07. У вер. 1903 яўр. пагром адбыўся ў Гомелі, у якім удзельнічала і частка паліт. несвядомых рабочых чыг. майстэрняў. У кастр. 1905 чарнасоценцам удалося арганізаваць яўр. пагромы ў Полацку, Оршы, Рэчыцы і інш. У 1920-я г. яўр. пагромы на тэр. Беларусі ўчынялі польскія акупац. ўлады, атрады С.Булак-Балаховіча, бандыцкія фарміраванні. У гады сталінскага тэрору былі ліквідаваны створаныя ў 1920-я г. яўр. культ.-асв. арг-цыі і школы, распачаты рэпрэсіі супраць дзеячаў яўр. культуры. На тэр. Беларусі ў час яе акупацыі ням. фашыстамі створана 70 лагераў смерці (гета) і знішчана больш за 300 тыс. яўрэяў. Пасля вайны ўлады Беларусі (як і інш. рэспублік б. СССР) праводзілі палітыку скрытага А., а сёння ён пакладзены ў аснову дзейнасці розных груповак і аб'яднанняў, якія стаяць на пазіцыях вялікадзяржаўнага шавінізму.

*Літ.*: Бебель А. Социал-демократия и антисемитизм. Спб., 1907; Ларин Ю. Евреи и антисемитизм в СССР. М.; Л., 1929; Бич М.О. Рабочее движение в Белоруссии в 1861—1904 гг. Мн., 1983. *У.А.Семянюк.*

**АНТЫСЕ́ПТЫКА** (ад *анты...* + грэч. sēptikos гніласны), комплекс лячэбна-прафілактычных мерапрыемстваў, накіраваных на знішчэнне патагенных мікробаў у пашкоджаных тканках або арганізме ў цэлым, на папярэджанне або ліквідацыю інфекц. запаленчага працэсу. Пры мясцовай А. *антысептычныя сродкі* ўплываюць непасрэдна на інфекцыю ў ране, пры агульнай лек. рэчывы дзейнічаюць праз кроў.

У практыцы выкарыстоўваюць мех. (хірург. апрацоўка раны), фіз. (гіграскапічная павязка, ультрагук, ультрафіялетавыя прамяні), хім. (хлорзамяшчальныя злучэнні, к-ты, шчолачы, спірты і інш. рэчывы, якія знішчаюць ці стрымліваюць развіццё мікробаў, актывізуюць ахоўныя сілы арганізма і фагацытоз), біял. (антыбіётыкі, бактэрыяфагі) і спалучаныя метады А. У хірург. практыку А. ўпершыню ўвёў англ. хірург Дж. Лістэр (1867).

**АНТЫСЕПТЫ́ЧНЫЯ СРО́ДКІ**, антысептыкі, хімічныя рэчывы з процімікробным дзеяннем. Адрозніваюць А.с. з бактэрыястатычным (затрымліваюць рост і развіццё мікраарганізмаў) і бактэрыцыдным (знішчаюць мікраарганізмы) дзеяннем. Як А.с. ў медыцыне выкарыстоўваюцца для абеззаражвання ран, скуры, пры гнойна-запаленчых працэсах, для дэзінфекцыі ёд, хлор, пераксід вадароду, марганцавакіслы калій, сулема, спірты, карболавая кіслата і інш.; для кансервавання прадуктаў — воцатная, бензойная, саліцылавая кіслоты; для захавання драўніны, скуры, пластмасы, тэкст. вырабаў — фторысты натрый, медны купарвас, антрацэнавае, сланцавае масла і інш.

**АНТЫСТА́ТЫКІ**, хімічныя злучэнні, якія зніжаюць статычную электрызацыю палімерных рэчываў. Дзеянне А. павышае электраправаднасць сінт. матэрыялаў і абумоўлівае ўцечку зараду з іх. Як А. выкарыстоўваюцца высокадысперсныя электраправодныя рэчывы (напр., сажа, графіт, *аксіды* металаў), *паверхнева-актыўныя рэчывы*, плёнкаўтваральныя палімеры (напр., поліакрылавая кіслата, полістыролсульфакіслата). А. наносяць на паверхню сінт. валокнаў, пластмасаў, тэкст. вырабаў ці ўводзяць у састаў матэрыялу (да 50% ад масы). Статычная (наведзеная) электрычнасць дрэнна ўплывае на чалавека (выклікае стомленасць і дыскамфорт), на паказанні высокаадчувальнай электроннай апаратуры. Для бытавых патрэб пажаданы выпуск А. у выглядзе аэразоляў.

**АНТЫСФЕ́Н** (Antisthenēs; каля 444 — каля 365 да н.э.), старажытнагрэчаскі філосаф, заснавальнік школы *кінікаў*. Вучань сафіста Горгія, потым *Сакрата*, пасля смерці якога адкрыў уласную школу. Лічыў паняцці абстракцыямі рэчаў, якія адзіныя рэальна існуюць. Вышэйшым крытэрыем ісціннасці і мэтай жыцця лічыў дабрачыннасць. Аддаваў увагу праблемам этыкі, прапагандаваў вяртанне да «натуральнага стану», адмову ад багацця, раскошы, пачуццёвай асалоды, вёў аскетычны лад жыцця. У сферы палітыкі адмаўляў дзяржаву, паліт. дзейнасць, сац. роўнасць і інш. сац. «ўмоўнасці».

**АНТЫТАКСІ́НЫ** (ад *анты...* + *таксіны*), спецыфічныя бялкі (*антыцелы*), якія ў адрозненне ад *антыдотаў* утвараюцца самім арганізмам чалавека і жывёл пад уплывам *таксінаў* і здольныя нейтралізаваць іх адмоўнае ўздзеянне. Па хім. прыродзе пераважна *імуналабуліны* класа G. Нейтралізуюць таксіны, якія яшчэ не звязаны з клеткамі арганізма. З'яўляюцца адным з фактараў *імунітэту* і выконваюць гал. ахоўную ролю ў выпадках інтаксікацый арганізма. А. — дзеючы пачатак антытаксічных сываратак, якія атрымліваюць праз імунізацыю жывёл абясшкоджанымі таксінамі або малымі дозамі натыўных таксінаў. Прэпараты А. выкарыстоўваюць для прафілактыкі і лячэння дыфтэрыі, слупняку, батулізму, газавай гангрэны, стрэптакокавых і стафілакокавых захворванняў, укусаў ядавітых жывёл.

**АНТЫТА́ЎР** (Anti-Taurus), горы на Пд Турцыі, у цэнтр. ч. *Таўра*. Даўж. каля 200 км. Утвораны 2 паралельнымі хрыбтамі — Тахталы (выш. да 3054 м, г. Бей) і Бінбога (выш. да 2830 м, г. Бінбога). Складзены пераважна з асадкавых парод. На Пн — сухі стэп, на Пд — участкі хваёвых субтрапічных лясоў і хмызнякоў (фрыгана).

**АНТЫТРЫНІТА́РЫІ** (ад *анты...* + лац. trinitas тройца), прыхільнікі хрысц. плыняў і абшчын, якія адмаўляюць догмат пра трыадзінства Бога (Тройцу). Рух і вучэнне А. бяруць пачатак у 2—3 ст., калі ўсталёўваліся асн. догматы хрысціянства. Вучэнне асуджана Усяленскімі саборамі, але ў сярэднія вякі яго прытрымліваліся прыхільнікі *наміналізму*, асобныя ерэтычныя рухі. Нярэдка ідэі антытрынітарызму былі своеасаблівай праявай *вальнадумства*. У сваіх поглядах А. абапіраліся на вучэнне неаплатанізму, пантэізм, выходзілі з таго, што першапачатковае хрысціянства не прадпісвала ніякіх догматаў. Веру ў Тройцу яны лічылі лагічным непаразуменнем, народжаным недасканаласцю схаластычнага мыслення. З адмаўленнем Тройцы А. спалучалі пераасэнсаванне боскай прыроды Хрыста, што падрывала хрысц. версію замагільнага жыцця. Многія А. лічылі смерць натуральным працэсам, Святы дух трактавалі не як самастойную субстанцыю, а як атрыбут Бога-айца. Яны патрабавалі ўзгаднення палажэнняў рэлігіі з розумам, адстойвалі права кожнага чалавека свабодна чытаць і інтэрпрэтаваць Біблію.

Распаўсюджанне ідэй антытрынітарызму на Беларусі ў 16 ст. звязана з рэфармацыйным рухам у Зах. Еўропе, прадстаўнікі якога (Г.Бляндрата, П.Альтыяці, В.Джэнтылі і інш.) наведвалі Беларусь. Умацаванню руху А. на Беларусі садзейнічалі таксама творы ісп. мысліцеля М.Сервета «Сем кніг памылковых поглядаў на Тройцу», «Аднаўленне хрысціянства» і інш. На аснове рэліг. рацыяналізму А. фарміравалася айч. атэістычная думка (К.Бекеш, С.Лован, Ф.Даманеўскі, Ян Ліцыній Намыслоўскі, К.Лышчынскі і інш.). У 16 ст. ў руху А. на Беларусі ўтварыліся 2 кірункі: памяркоўны і радыкальны. Прадстаўнікі першага (С.Будны, В.Цяпінскі і інш.) для абгрунтавання сваіх поглядаў выкарыстоўвалі ант. спадчыну і абвяргалі апалагетыку схаластыкі, якая пры дапамозе

сафістыкі імкнулася абараніць хрысц. догматы. Яны адзначалі непазбежнасць сац. расслаення грамадства, выступалі ў абарону дзярж. ладу, былі прыхільнікамі яго паступовага эвалюц. ўдасканалення. Ідэолагі радыкальнай плыні (Якуб з Калінаўкі, Пётр з Ганёндза, Павел з Візны, М.Чаховіц), якія адстойвалі інтарэсы і грамадскія ідэалы нар. масаў, імкнуліся не да часовых рэформаў, а да радыкальных сац.-паліт. пераўтварэнняў, выступалі супраць прыватнай уласнасці, саслоўных прывілеяў, сац. і маёмаснай няроўнасці, патрабавалі скасавання дзярж. ін-таў. Большасць з іх адмоўна ставілася да філас. і тэалагічнай спадчыны, прызнавала толькі аўтарытэт Свяшчэннага пісання і асабістай веры. Важную ролю ў рацыяналізацыі дактрыны А., ператварэнні яе з рэліг. у філас. адыграла распаўсюджанне на Беларусі *сацыніянства*. А. зазналі ганенне каталіцкай царквы і артадаксальнага пратэстантызму. У 1647 друкарні і школы А. зачынены, а ў 1658—60 іх паслядоўнікі выгнаны з Рэчы Паспалітай. Вучэнне А. працягвае існаваць, яго прытрымліваюцца многія пратэстанцкія абшчыны.

*Літ.*: Падокшын С.А. Філасофская думка эпохі Адраджэння ў Беларусі: Ад Францыска Скарыны да Сімяона Полацкага. Мн., 1990; Саверчанка І.В. Сымон Будны: Гуманіст і рэфарматар. Мн., 1993; Szczucki L. Antytrynitaryzm w Europie wschodniej // Odrodzenie i Reformacja w Polsce. 1979. T. 24. *С.А.Яцкевіч.*

**АНТЫТЭ́ЗА** (ад грэч. antithesis процістаўленне) у літаратуры, *стылістычная фігура*, супастаўленне кантрастных або процілеглых з'яў і паняццяў, якое ўтварае адзінае структурна-лагічнае цэлае. Семантычны кантраст звычайна перадаецца пры дапамозе антонімаў з выкарыстаннем рытмічнага і сінтаксічнага паралелізму (напр., «лепей з разумным згубіць, чым з дурнем знайсці»). На аснове А. будуюцца і вял. эпічныя творы, што выяўляецца ў іх назвах — «Вайна і мір» Л.Талстога, «Агонь і снег» І.Шамякіна.

**АНТЫУТО́ПІЯ**, плынь грамадскай думкі, прадстаўнікі якой адмаўляюць магчымасць стварэння дасканалага грамадства і лічаць, што любыя намаганні пабудаваць адвольна спраектаваны грамадскі лад прыводзяць да катастрафічных наступстваў. Гіст. А. паходзіць ад сатыр. традыцыі Дж.Свіфта, Вальтэра, У.Ірвінга, С.Батлера, М.Е.Салтыкова-Шчадрына, Г.К.Чэстэртана, Г.Уэлса і інш. У раманах і публіцыст. творах Я.Замяціна («Мы»), О.Хакслі («Гэты цудоўны новы свет», «Малпа і сутнасць»), Дж.Оруэла («Ферма жывёл», «1984 год»), А.Кёстлера («Цемра ў поўдзень»), Л.Мэмфарда («Міф аб машыне») і інш. утапічныя праекты ўяўляюцца як насілле над чалавечай прыродай, якое вядзе да таталітарызму. Да твораў-А. можна далучыць і раманы-папярэджанні Дж.Лондана, К.Чапека, А.Франса, Р.Брэдберы, А.Азімава, І.Яфрэмава і інш. Асаблівае пашырэнне А. набыла пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 у Расіі, якая практычна пацвердзіла немагчымасць ажыццяўлення сац. ідэалаў. Як і *утопія*, А. гал. чынам канструюецца з дапамогай метаду ідэалізацыі, але з адваротным знакам. Пры гэтым у ёй могуць выкарыстоўвацца прадказанні, у т.л. і навук. прагнозы. А. заснавана на абсалютызацыі аб'ектыўных негатыўных тэндэнцый і ўяўляе сабой вобразатвор абсалютна недасканалага, дрэннага і суб'ектыўна непажаданага з пункту погляду безумоўных агульначалавечых каштоўнасцяў грамадскага ладу. А. ў пэўнай меры выконвае і функцыю рэгулятара дзейнасці і функцыю папярэджання, перасцярогі ад утопіі. Створаны ў ёй вобраз грамадскага будучага можа выкарыстоўвацца ў якасці ідэалізаванага аб'екта ў сац. пазнанні.

*Літ.*: Бердяев Н. ...Смысл истории. М., 1990; Утопия и утопическое мышление. Антол. зарубеж. лит.: Пер. с англ., нем., фр. и др. М., 1991. *Г.А.Антанюк.*

**АНТЫФАШЫ́ЗМ**, ідэйна-паліт. плынь і грамадскі рух прадстаўнікоў грамадства, паліт. сіл розных светапоглядаў і ідэалогій, а таксама палітыка дэмакр. урадаў, накіраваная супраць *фашызму*. Узнік у Еўропе на пач. 1920-х г., каб процідзейнічаць уплыву фаш. арг-цый і партый на паліт. жыццё і дзярж. ўладу. Значнага размаху дасягнуў з устанаўленнем у 1930-я г. адкрытых фашысцкіх дыктатур у Германіі, Італіі, Іспаніі, актывізацыяй фаш. сіл у шэрагу інш. еўрап. краін. У 2-ю сусв. вайну А. з'явіўся асновай *антыгітлераўскай кааліцыі*, вызв. барацьбы народаў свету супраць дзяржаў «восі» (Германія, Італія, Японія). Пасля вайны А. садзейнічаў пераадоленню рэшткаў фашызму ў грамадскім жыцці, нац. аднаўленню і адраджэнню. Захоўвае значэнне як сродак процідзеяння *неафашызму*. *В.І.Боўш.*

**АНТЫФАШЫ́СЦКАЕ ВЯ́ЧА НАРО́ДНАГА ВЫЗВАЛЕ́ННЯ ЮГАСЛА́ВІІ**. Заснавана ў 1942 як вышэйшы палітычны прадстаўнічы орган, які аб'ядноўваў усе патрыят. сілы Югаславіі для барацьбы супраць фаш. акупантаў. У ліст. 1943 пераўтворана ў вярх. заканад. орган краіны; выбраны Прэзідыум вяча і створаны Нац. к-т вызвалення Югаславіі — часовы рэв. ўрад на чале з І.Брозам-Цітам. У жн. 1945 перайменавана ў Часовую нар. скупшчыну, якая дзейнічала да выбараў ва Устаноўчую скупшчыну ў ліст. 1945.

**АНТЫФАШЫ́СЦКАЯ ЛІ́ГА НАРО́ДНАЙ СВАБО́ДЫ**, палітычная арг-цыя ў Бірме (цяпер М'янма) у 1944—64. Створана ў жн. 1944 як арг-цыя нац. фронту супраць яп. акупацыі краіны. Заснавальнікі — Камуніст., Нац. рэв. (з 1945 Сацыяліст.) партыі, Нац. армія і інш. Ліга ўзначальвала антыяпонскае паўстанне 1945, барацьбу за дзярж. незалежнасць Бірмы пасля вяртання ў краіну англічан (1945—47). У 1948—62 была кіруючай. Праграма Лігі прадугледжвала пабудову марксісцкай мадэлі сацыялізму ў спалучэнні з будызмам. У канцы 2-й сусв. вайны Ліга налічвала больш за 200 тыс. чал. Яе старшынямі былі Аун Сан (1944—47), У Ну (1947—62). У 1958 Ліга падзялілася на 2 фракцыі, адна з якіх у 1960 стала Саюзнай партыяй, а другая захавала старую назву; абедзве распушчаны ў 1964. Пераемніцай Лігі стала створаная ў 1988 Нац. ліга за дэмакратыю на чале з Су Чжы, дачкой Аун Сана.

**АНТЫФАШЫ́СЦКІ КАНГРЭ́С ДЗЕ́ЯЧАЎ КУЛЬТУ́РЫ 1936** у Львове, кангрэс прадстаўнікоў інтэлігенцыі Польшчы, Зах. Украіны і Зах. Беларусі. Скліканы 16—17.5.1936 з мэтай умацавання адзінага антыфаш. фронту. У ім удзельнічалі вядомыя дзеячы л-ры, мастацтва, навукі. У сваёй рэзалюцыі кангрэс выказаў пратэст супраць нац. прыгнёту, паліт. бяспраўя працоўных супраць праследаванняў дзеячаў культуры, ліквідацыі рабоча-сял. друку, распальвання міжнац. варожасці, заклікаў інтэлігенцыю змагацца за развіццё навукі і культуры народаў, прыгнечаных Польшчай, актывізаваць барацьбу супраць наступлення фашызму, падрыхтоўкі новай сусв. вайны.

**АНТЫФАШЫ́СЦКІ НАРО́ДНЫ ФРОНТ** у Заходняй Беларусі, масавы дэмакр.-вызв., антыфаш. народны рух. Развіўся на глебе барацьбы супраць наступлення сіл рэакцыі ў Польшчы і пагрозы вайны ў 2-й пал. 1930-х г. Ініцыятарам руху выступіла КПЗБ, якая выходзіла з распрацаванай КПП у вер. 1935 платформы дзеянняў, у аснове якой былі праграмныя ўстаноўкі VII Кангрэса Камінтэрна (1935). У канцы 1935—36 паміж партыямі і арг-цыямі рознай паліт. арыентацыі (КПЗБ, Бунд, Паадей Цыён, Стронніцтва людовэ) створаны адзінафрантавыя к-ты і камісіі ў Беластоку, Вільні, Гродне, Баранавічах, Брэсце, Лідзе, Бельску і інш. У 1936 дасягнута дамоўленасць паміж прадстаўнікамі КПЗБ і Бел. хрысціянскай дэмакратыі пра сумесную барацьбу за школу на роднай мове. На працягу 1936—37 адбыўся шэраг выступленняў працоўных Зах. Беларусі (гл. *Баранавіцкі адзінафрантавы мітынг працоўных 1936, Гродзенскія адзінафрантавыя выступленні працоўных 1936* і інш.) у абарону дэмакр. і сац. заваёў, супраць нац. прыгнёту, пачаўся масавы збор дэкларацый за адкрыццё школ на роднай мове. На развіццё А.н.ф. адмоўна паўплывалі ўзмоцненыя рэпрэсіі польскіх улад і паліт. рэпрэсіі ў СССР, непаслядоўнасць і ваганні розных паліт. сіл. Роспуск у жн. 1938 КПП і КПЗБ практычна спыніў працэс складвання А.н.ф. ў Зах. Беларусі.

*У.Ф.Ладысеў.*

**АНТЫФАШЫ́СЦКІ РУХ**, зарадзіўся на пач. 1920-х г. са з'яўленнем на паліт.

арэне *фашызму*, актывізаваўся з усталяваннем фаш. рэжымаў у Германіі, Іспаніі і інш. краінах. Да пач. 2-й сусв. вайны прайшоў у сваім развіцці некалькі этапаў, узбагаціўся практыкай барацьбы супраць спроб фаш. пераваротаў у Аўстрыі і Францыі (1934), Іспаніі (1936—39). Тэарэт. асновы А.р. распрацаваны прадстаўнікамі камуністычных, сацыял-дэмакр., хрысц.-дэмакр. партый. Гэта дало магчымасць ужо ў канцы 1920-х г. прыпыніць пагрозу фашызму, арганізаваўшы адзіны пралет. фронт, які ў далейшым стаў апорай шырокага дэмакр. фронту з удзелам пэўных слаёў буржуазіі. VII Кангрэс Камінтэрна (1935) выпрацаваў тактыку адзінага Народнага фронту. Аднак сектанцтва, дагматычны падыход да развіцця А.р. кіраўніцтва СССР і КПСС, якое абвінавацілa с.-д. партыі ў т.зв. сацыял-фашызме, і іх рэакцыя ў адказ, курс СССР на супрацоўніцтва з фаш. Германіяй у 1939—41, рэпрэсіі ў адносінах да шэрагу кампартый (асабліва Польшчы і Германіі) перашкодзілі рэалізацыі ідэй Нар. фронту. Найб. развіцця А.р. дасягнуў у час 2-й сусв. вайны, калі асновай барацьбы супраць фашызму стала *антыгітлераўская кааліцыя*. Усюды разгарнуўся *Рух Супраціўлення*, які стаў працягам А.р. даваен. перыяду. Значны ўклад у А.р. зрабілі і патрыёты Беларусі, якія ва ўмовах жорсткага акупац. рэжыму стварылі разгалінаваную сетку патрыят. і антыфаш. падполля, прынялі актыўны ўдзел у арганізацыі і развіцці *партызанскага руху на Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну* (гл. таксама *Антыфашысцкія арганізацыі* на Беларусі, *Патрыятычнае падполле* на Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну). Гэта дало магчымасць Беларусі стаць адной з членаў-заснавальніц Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Пасля ваен.-паліт. разгрому асн. ачагоў фашызму (Германія, Італія, Японія) праблемы А.р. не былі зняты з парадку дня. У заканадаўстве шэрагу краін свету распрацаваны спец. законы, накіраваныя на забарону фашызму і ўмоў для яго дзейнасці, паколькі эканам., паліт., этн. і сац. ўмовы для адраджэння фаш. пагрозы захаваліся. *А.А.Чалядзінскі.*

**АНТЫФАШЫ́СЦКІЯ АРГАНІЗА́ЦЫІ на Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну**, падпольныя патрыятычныя арг-цыі, якія дзейнічалі пераважна ў зах. абласцях акупіраванай Беларусі. Узнікалі найчасцей па ініцыятыве і пад кіраўніцтвам б. членаў КПЗБ і КСМЗБ. Асновай А.а. на Беларусі была ячэйка (група) з 3—5 чал. на чале з сакратаром; 5—7 ячэек аб'ядноўваліся ў падраёны, 3—4 падраёны — у падпраённую арг-цыю, якой кіраваў камітэт. На тэр. Беларусі дзейнічалі 2 абласныя (Беластоцкая і Брэсцкая), 3 акруговыя (Баранавіцкая, Беластоцкая, Брэсцкая), 4 гарадскія (Беластоцкая, Брэсцкая, Гродзенская, Слонімская), 27 раённых А.а., якія аб'ядноўвалі сотні груп, больш за 12 тыс. чал. Вакол іх групаваліся «сімпатыкі» (спачувальнікі), якія дапамагалі арганізоўваць барацьбу насельніцтва з акупантамі. А.а. ўзаемадзейнічалі з партызанамі, дастаўлялі ім зброю, боепрыпасы, адзенне, медыкаменты, прадукты, здабывалі для іх разведінфармацыю, накіроўвалі да партызанаў мясц. жыхароў, вызваленых ваеннапалонных. Пасля стварэння падп. парт. органаў дзейнасць А.а. на Беларусі ўскладнілася, парт. к-ты часам вымушалі арг-цыі да самароспуску. Кіраўнікамі антыфаш. падполля былі І.П.*Урбановіч*, А.С.*Азончык*, М.Е.*Крыштафовіч*, Д.К.*Сукачоў*, Я.М.Афанасьеў, Б.І.Гардзейчык, А.М.Дурэйка, І.І.Жышко, А.Ф.Манкевіч, Ф.З.Місько, М.А.Несцярук, М.І.Паўлоўскі, М.М.Уладыка, М.Ф.Трында, В.В.Янушка і інш.

**АНТЫФЕАДА́ЛЬНАЯ ВАЙНА́ 1648—51 на Беларусі**. Народны антыфеад. рух на Беларусі супраць пануючага класа феадалаў у сярэдзіне 17 ст. пад уплывам паўстання на Украіне пад кіраўніцтвам Б.*Хмяльніцкага* перарос у А.в. У падтрымку гэтага руху Хмяльніцкі паслаў на Беларусь казацкія атрады (загоны, у іх было шмат беларусаў) на чале з Галавацкім, Гладкім, І.Галотай, А.Нябабай і інш. Найб. актыўныя ваен. дзеянні адбыліся на Пд і ПдУ Беларусі. Летам і восенню 1648 казакі і сяляне-паўстанцы авалодалі Бабруйскам, Брагінам, Гомелем, Кобрынам, Мазыром, Пінскам і інш. Восенню 1648 сфарміраваны шляхецкія апалчэнні, якімі камандаваў польны гетман ВКЛ Януш Радзівіл, павялічана колькасць наёмнікаў. Каб ізаляваць бел. землі ад пранікнення казакоў, Радзівіл, сабраўшы 12—14 тыс. войска, накіраваў яго часткамі на чале з Мірскім, Валовічам і Я.Пацам да Пінска, Чачэрска і інш. гарадоў, захопленых паўстанцамі. У баі за Пінск загінула больш за 3 тыс. жыхароў, горад быў спалены, больш за 1500 паўстанцаў загінула ў баі за Чэрыкаў. На пач. 1649 урадавыя войскі вызвалілі ад казакоў і паўстанцаў Давыд-Гарадок, Тураў, Петрыкаў, Бабруйск і жорстка расправіліся з імі. У 1-й пал. 1649 войскі ВКЛ задушылі паўстанне. Летам 1649 на Беларусь зноў прыйшлі казацкія атрады Р.Гаркушы, С.Падабайлы, М.Крычэўскага і інш., да якіх далучаліся мясц. сяляне і гараджане. У баях загінулі казацкія атаманы Галота, М.Нябаба, Крычэўскі, Міхненка і інш. У ліп. адбылася *Лоеўская бітва 1649*. Ваен. дзеянні працягваліся да восені 1651. Пасля паражэння Б.Хмяльніцкага пад Берасцечкам і заключэння *Белацаркоўскага дагавора 1651* казацкія атрады выведзены з Беларусі і вайна скончылася.

*Літ.*: Похилевич Д.Л. Крестьяне Белоруссии и Литвы в XVI—XVIII вв. Львов, 1957; Шуляковский Е.Г. Участие белорусского народа в освободительной войне 1648—1654 гг. // Вопр. истории. 1954. № 5.

**АНТЫФЕДЭРАЛІ́СТЫ** (англ. Antifederalists), палітычная партыя ў ЗША ў 1787—91. Створана пад кіраўніцтвам Т.Джэферсана ў перыяд распрацоўкі і прыняцця канстытуцыі 1787 у процівагу *федэралістам*. Сац. база — фермеры, сельскія прадпрымальнікі, гар. дробная буржуазія, плантатары. А. кіравалі барацьбой за прыняцце *«Біля аб правах»*, выступалі супраць моцнай улады федэральнага ўрада — за прыярытэт правоў асобных штатаў і грамадзян, дэмакратызацыю канстытуцыі; у знешняй палітыцы падтрымлівалі рэв. Францыю. Пасля 1791 на базе А. створана Дэмакр.-рэсп. партыя.

**АНТЫФЕРАМАГНЕТЫ́ЗМ** (ад *анты...* + *ферамагнетызм*), магнітаўпарадкаваны стан рэчыва, якому ў адсутнасць знешняга магн. поля адпавядае антыпаралельная арыентацыя магн. момантаў суседніх атамаў (іонаў) і нулявая намагнічанасць рэчыва ў цэлым. Выяўлены ў канцы 1920-х г., тэарэтычна абгрунтаваны Л.Неелем (1932, Францыя) і Л.Д.Ландау (1933).

Антыферамагн. структура — сістэма ўстаўленых адна ў адну магн. падрашотак, у вузлах якіх знаходзяцца іоны аднаго віду з аднолькавымі па значэнні і напрамку *магнітнымі момантамі*. У знешнім магн. полі антыферамагнетыкі слаба намагнічваюцца. Пры т-рах вышэй за *Нееля пункт* ($T_N$) антыферамагн. парадак разбураецца за кошт цеплавога руху атамаў (іонаў) і антыферамагнетык пераходзіць у парамагн. стан (*фазавы пераход* 2-га роду), таму пры $T=T_N$ тэмпературныя залежнасці магн. успрымальнасці, цеплаёмістасці і інш. маюць анамаліі. На частотах, блізкіх да ўласнай частаты прэцэсіі магн. момантаў падрашотак, назіраецца *антыферамагнітны рэзананс*.

*Літ.*: Преображенский А.А., Бишард Е.Г. Магнитные материалы и элементы. 3 изд. М., 1986. *Р.М.Шахлевіч.*

**АНТЫФЕРАМАГНЕ́ТЫК**, рэчыва, у якім усталяваўся антыферамагнітны парадак магнітных момантаў атамаў ці іонаў. Рэчыва становіцца А. ніжэй за пэўную т-ру ($T_N$; гл. *Нееля пункт*) і застаецца ім звычайна да $T=0$ К. Да А. адносяцца: цвёрды кісларод (α-мадыфікацыя пры $T_N<24$ К), хром ($T_N=310$ К), шэраг рэдказямельных металаў, многія злучэнні, у састаў якіх уваходзяць пераходныя металы (аксіды, фтарыды, сульфіды, галагеніды, карбанаты і інш.). А. перспектыўныя для выкарыстання ў прыладах запісу і апрацоўкі інфармацыі, стварэння акустычных ліній затрымкі, як магн. элементы ў магнітаоптычных запамінальных прыладах.

**АНТЫФЕРАМАГНІ́ТНЫ ПУНКТ НЕ́ЕЛЯ**, тое, што *Нееля пункт*.

**АНТЫФЕРАМАГНІ́ТНЫ РЭЗАНА́НС**, рэзкае павелічэнне паглынання энергіі электрамагнітных хваляў, што праходзяць праз *антыферамагнетык*, пры пэўных (рэзанансных) значэннях частаты і напружанасці прыкладзенага магн. поля; разнавіднасць электроннага *магнітнага рэзанансу*.

Пры А.р. ўзбуджаюцца рэзанансныя ўзаемна звязаныя ваганні вектараў намагнічан-

насці магн. падрашотак антыферамагнетыка адносна ўзаемнага размяшчэння і адносна напрамку прыкладзенага поля. Частата гэтых ваганняў вызначаецца значэннем эфектыўных магн. палёў, што ўздзейнічаюць на магн. моманты падрашотак (поле абменнага ўзаемадзеяння падрашотак, поле магн. анізатрапіі, вонкавае статычнае магн. поле). А.р. дае магчымасць выявіць значэнні эфектыўных магн. палёў у антыферамагнетыках, іх структуру і інш. ўласцівасці.

**АНТЫФЕРМЕ́НТЫ** (ад *анты...* + *ферменты*), спецыфічныя бялкі з групы *антыметабалітаў*, якія затрымліваюць або блакіруюць дзеянне ферментаў праз утварэнне з імі неактыўных комплексаў. Наяўнасць А. у органах і тканках ахоўвае іх ад разбуральнага ўздзеяння пэўных ферментаў (напр., сценкі страўніка і кішэчніка ад уздзеяння стрававальных ферментаў). Штучна сінтэзаваны лек. прэпараты, якія маюць уласцівасці А., напр. эзерын, празерын, факурыт (дыякарб), трасілол і інш.

**АНТЫФІДА́НТЫ**, гл. ў арт. *Рэпеленты*.

**АНТЫФО́ННАЕ СПЯВА́ННЕ** (ад грэч. antiphonos які гучыць у адказ), папераменнае выкананне песнапення 2 харамі ці салістам і хорам.

Вытокі А.с. ў найстаражытнейшых нар.-песенных формах выканання, у стараж.-грэч. трагедыі, дзе хор часта падзялялі на 2 паўхары, у кульце народаў Усходу. У хрысц. богаслужэнне А.с. ўведзена ў 1 ст. н.э., у зах. хрысц. царкве — у 4 ст. У праваслаўнай царкве, як правіла, чаргаваліся спевы 2 жаночых або мужчынскага і дзіцячага хароў, у каталіцкай царкве — спевы свяшчэнніка, цэлага хору і яго часткі.

Карані ўсходнеслав. А.с. ў карагодных песнях, якія суправаджаліся сыходным і разыходным рухам процілеглых радоў (напр., у песні «Проса» з формай руху «сцяна на сцяну», пашыранай у розных меладычных варыянтах у беларусаў, рускіх і ўкраінцаў). На Беларусі падобныя формы да нашага часу сустракаюцца ў Паазер'і і зах. раёнах (напр., у абрадзе «бараны», зафіксаваным у 1981 у Докшыцкім р-не, 3 групы спявачак па чарзе выконваюць строфы песень розных каляндарных жанраў у тым парадку, як яны размешчаны ў гадавым крузе). Яны ўласцівыя вясельным і жніўным песням. Своеасаблівую трактоўку набывае А.с. ў купальскай абраднасці. *Л.П.Касцюкавец.*

**АНТЫФРА́ЗІС** (грэч. antiphrasis) у л і т а р а т у р ы, *стылістычная фігура*, ужыванне слова ў процілеглым, звычайна іранічным, значэнні. Часцей сустракаецца ў сатыр. творах, напр. у байцы К.Крапівы «Мандат» пра асла гаворыцца: «Ну й розум. Вось дык галава!».

**АНТЫФРЫ́З** (ад *анты...* + лац. freeze замярзаць), вадкасць з нізкай тэмпературай замярзання, прызначаная для ахаладжэння рухавікоў унутр. згарання, радыёэлектроннай апаратуры, прамысл. цеплаабменнікаў, якія працуюць пры нізкіх т-рах. Як А. выкарыстоўваюць водныя растворы *этыленгліколю, гліцэрыны, спіртоў* (метылавага, этылавага і ізапрапілавага), неарган. соляў (пераважна хлорыстага кальцыю); т-ра замярзання залежыць ад прыроды і канцэнтрацыі рэчываў і можа быць ад -10 да -75 °С. У тэхніцы выкарыстоўваюць 52,6 і 66%-ныя растворы этыленгліколю з т-рай замярзання -40 і -65 °С адпаведна.

**АНТЫФРЫКЦЫ́ЙНЫЯ МАТЭРЫЯ́ЛЫ** (ад *анты...* + лац. frictio трэнне), матэрыялы для дэталяў машын, якія працуюць ва ўмовах трэння слізгання (падшыпнікі, укладышы, утулкі і інш.). А.м. маюць высокую ўстойлівасць да зносу і карозіі, добрую прыработку, мінім. каэфіцыент трэння, вытрымліваюць мех. нагрузкі без змены ўласцівасцяў. Антыфрыкцыйныя ўласцівасці А.м. залежаць ад структурнага стану паверхневых слаёў, мікратапаграфіі кантактуючых паверхняў і ўмоў фрыкцыйнага ўзаемадзеяння.

Найб. пашыраныя А.м.: сплавы на аснове каляровых металаў (*бабіты, бронза, латунь* і інш.), чыгун, пластычныя масы, драўніна (у т.л. мадыфікаваная), кампазіты на аснове металаў, металакерамікі і паліметраў. Асобная група А.м. — самазмазвальныя матэрыялы; яны змяшчаюць кампаненты (напр., графіт), якія выконваюць пры трэнні ролю змазвальнага асяроддзя. Для надання матэрыялам антыфрыкцыйных уласцівасцяў іх паверхню мадыфікуюць хіміка-тэрмічнай, лазернай, іонна-прамянёвай апрацоўкай, нанясеннем зносаўстойлівых пакрыццяў, паверхневапластычным дэфармаваннем. А.м. выкарыстоўваюць ва ўмовах сухога трэння (у газах, паветры, вакууме); для работы з малавязкімі вадкасцямі без змазвальнага дзеяння (вада, арган. растваральнікі), з вадкімі ці пластычнымі змазкамі. На Беларусі вывучэннем і стварэннем А.м. займаюцца ін-ты механікі металапалімерных сістэм і фізіка-тэхнічны АН Беларусі, Беларускае НВА парашковай металургіі. *А.У.Белы.*

**АНТЫ́ХРЫСТ**, у хрысціянскай міфалогіі і тэалогіі праціўнік Ісуса Хрыста, які павінен з'явіцца ў канцы гісторыі (гл. *Эсхаталогія*) і ўзначаліць скрытую татальную вайну супраць хрысціянства, але будзе пераможаны ў час 2-га прышэсця Хрыста на Зямлю. Прароцтвы А. ёсць у старазапаветных кнігах Бібліі, яго прыход сімвалічна апісаны і ў Новым Запавеце. Увасабляе даўнюю варожасць «анёлаў цемры» да хрысціянства, поўнае адмаўленне хрысц. веры і маралі. А. уяўляецца магутным чалавекам, надзеленым дэманічнай сілай Д'ябла, які прыходзіць у зманлівым абліччы Хрыста. Паводле апостала Паўла, у царстве А. людзі будуць самалюбівыя, зламоўныя, абыякавыя да любові і дабра, нахабныя, больш палюбяць раскошу, чым Бога. А. — увасабленне дэманічнага пачатку ў чалавеку і грамадстве, спроба ўсталяваць бязбожную ўладу над зямлёй і космасам. Міфу пра А. прысвечаны фрэскі Л.Сіньярэлі, гравюры Л.Кранаха Старэйшага; аблічча А. апісаў Сімяон Полацкі ў творы «Жазло праўлення» (1667) і інш. *У.М.Конан.*



Антыцыклон. Ізабары і прыземныя лініі плыні паветра: *а* — Паўночнае паўшар'е; *б* — Паўднёвае паўшар'е.

**АНТЫЦЕ́ЛЫ**, складаныя бялкі — *імунаглабуліны*, якія сінтэзуюцца клеткамі лімфатычнай тканкі чалавека і цеплакроўных жывёл пад уплывам *антыгенаў*. Здольныя спецыфічна звязвацца з імі ў імунныя комплексы, што забяспечваецца прасторавай узаемадапаўняльнасцю (*камплементарнасцю*) паверхняў малекул А. і антыгена. Дзякуючы рэакцыям звязвання А. з антыгенамі адбываецца нейтралізацыя мікробных таксінаў, імабілізацыя і ўстараненне мікраарганізмаў, чужародных арганізму бялкоў і поліцукрыдаў, а таксама ўласных клетак са зменены паверхневай мембранай. Адначасова яна ляжыць у аснове патагенетычнага механізма анафілаксіі, сываратачнай хваробы і аўтаімунных захворванняў. У лабараторнай практыцы рэакцыя выкарыстоўваецца для дыягностыкі хвароб, ідэнтыфікацыі мікраарганізмаў і асобных рэчываў.

**АНТЫЦЫКЛО́Н** (ад *анты...* + *цыклон*), вобласць павышанага ціску ў атмасферы. Ціск з максімумам у цэнтры дасягае 1025—1070 мб на ўзр. м. У папярочніку ад соцень да 2—3 тыс. км; ахоплівае трапасферу. Вятры накіраваны ад цэнтра да перыферыі А., пад уплывам вярчэння Зямлі адхіляюцца ў Паўн. паўшар'і па гадзіннікавай стрэлцы, у Паўд. паўшар'і — супраць. Перамяшчаюцца са скорасцю 30—40 км/гадз з З на У, адхіляючыся да нізкіх шырот; некаторыя А. маларухомыя.

У А. пераважаюць сыходныя токі паветра, пры якіх адбываецца адыябатычнае награванне, таму т-ра на некалькі градусаў вышэй, чым у цыклонах. Аднак у зімовых маларухомых А. над кантынентамі ўмераных шырот адбываецца моцнае выстуджванне паветра. Для тэрыторый, занятых А., характэрны яснае і сухое надвор'е, тэмпературныя інверсіі, слабыя вятры. Узнікаюць А. штодзённа, найб. у субтропіках (*Азорскі антыцыклон*) і над кантынентамі (*Антарктычны антыцыклон, Азіяцкі антыцыклон* і інш.). Па тэр. Беларусі за год праходзіць 15—16 А., якія вызначаюць надвор'е каля 150 дзён. *І.Ю.Куляшова.*

**АНТЫЦЫПА́ЦЫЯ** (лац. anticipatio ад anticipo прадугадваю), 1) у п с і х а л о г і і і ф і л а с о ф і і здольнасць у той ці іншай форме прадбачыць развіццё падзей, з'яў, выніку дзейнасці; прадугадванне, загадзя складзенае ўяўленне пра што-небудзь. У п с і х а л о г і і мае 2 значэнні: чаканне арганізмам поўнай сітуацыі, што выяўляецца ў нейкай позе

ці руху; уяўленне чалавекам выніку сваёй дзейнасці да яе ажыццяўлення. У філасофіі ідэя А. сустракаецца ўжо ў вучэнні стоікаў і эпікурэйцаў аб пралепсісе — агульным паняцці, якое ўзнікае ў свядомасці яшчэ да ўспрымання канкрэтных адзінкавых рэчаў непасрэдна з *логасу*. Кант разумеў пад А. апрыёрнае (незалежнае ад вопыту) пазнанне прадметаў успрымання яшчэ да самога ўспрымання. 2) У логіцы — часовае прыняцце ў якасці даказанай пасылкі, якую мяркуецца абгрунтаваць пазней. 3) У эканоміцы — выплата грошай па даўгавым абавязацельстве раней за агавораны тэрмін.

**АНТЫЧАСЦІ́ЦА**, адна з аднолькавых па масе, часе жыцця, значэннях спіна і цотнасці *элементарных часціц*, якія маюць роўныя па модулі, але процілеглыя па знаку квантавыя лікі (зарады). Напр., электрон ($e^-$) і пазітрон ($e^+$) адрозніваюцца знакам эл. і лептоннага зарадаў і спіральнасці (палярызацыі); нейтрон (n) і антынейтрон ($\overline{n}$) — барыённага зараду і магн. моманту. У адпаведнасці з квантава-рэлятывісцкай прыродай элементарных часціц кожнай з іх адпавядае свая А., акрамя сапраўды нейтральных (не маюць ніякіх зарадаў) фатона, $\pi^0$ -мезона, $\rho^0$ -мезона, $\eta^0$ -мезона і j/ψ-часціцы. Характэрная асаблівасць пары часціца — А. — здольнасць да *анігіляцыі*. Кожнаму працэсу эл.-магн. і моцнага ўзаемадзеянняў адпавядае аналагічны працэс, у якім усе часціцы заменены А., і наадварот. Эксперыментальна даказана існаванне А. для ўсіх вядомых часціц. Зарэгістраваны найпрасцейшыя пасля *антыпратона* антыядры (антыдэйтрон, антытрытый, антыгелій). Прынцыпова магчыма існаванне антыатамаў, антымалекул і наогул *антырэчыва* з антыпратонамі, антынейтронамі і пазітронамі. *А.А.Богуш.*

Да арт. **Антычнае мастацтва.** Арка Ціта ў Рыме, 81 н. э.

Да арт. **Антычнае мастацтва.** Амфара. 360 да н.э.

**АНТЫ́ЧНАЕ ВЕРШАСКЛАДА́ННЕ**, від *метрычнага вершаскладання*, заснаваны на раўнамерным чаргаванні доўгіх і кароткіх складоў у радках. Узнікла ў 8 ст. да н.э. ў Стараж. Грэцыі, у 3 ст. да н.э. перайшло ў Рым. Асн. рытмічная адзінка антычнага верша — *стапа* з пэўным чаргаваннем доўгіх (-) і кароткіх (∪) складоў. Адзінка часу, неабходная для вымаўлення аднаго кароткага склада, наз. морай (у доўгім складзе былі 2 моры). Раўнамернае чаргаванне пэўных стоп стварала выразны метрычны малюнак, або *метр*; паўтарэнне той ці іншай колькасці аднолькавых стоп утварала *памер вершаваны*. Часам у вершаваных радках у строгай паслядоўнасці чаргаваліся розныя стопы (такія вершы наз. *лагаэдамі*).

Найб. важныя стопы: 3-морныя — *ямб* (∪ -), *харэй* (- ∪), трыбрахій (∪∪∪); 4-морныя — *дактыль* (- ∪∪), *амфібрахій* (∪-∪), *анапест* (∪∪ -), спандэй (- -); 5-морныя — бакхій (∪ - -), амфімакр (- ∪ -), антыбакхій (- - ∪ ) і 4 пеоны (- ∪∪∪, ∪ - ∪∪, ∪∪ - ∪, ∪∪ -), 6-морныя — молас (- - -), харыямб (- ∪∪ -), антыспаст, або ямбахарэй (∪ - - ∪), і 2 іонікі (∪∪ - - і - - ∪∪); 7-морныя — 4 эпітрыты (∪ - - -, - ∪ - -, - - ∪ -, - - - ∪).

Найб. пашыраныя вершаваныя памеры А.в. — *гекзаметр* і *пентаметр*. Антычныя аўтары не ведалі рыфмы, аднак строга вытрымлівалі ў радках чаргаванне аднатыпных *клаўзул*. Асобныя радкі ядналіся ў строфы (*алкеева страфа, сапфічная страфа, элегічны двувер*ш). А.в. зрабіла вял. ўплыў на ўсю еўрап. паэзію. У *сілаба-танічным вершаскладанні* захаваліся асн. прынцыпы метрычнай арганізацыі стапы, радка і страфы (толькі замест доўгіх складоў — націскныя, а замест кароткіх — ненаціскныя). У бел. сярэдневяковай паэзіі на лац. мове сістэмай А.в. карысталіся Я.Вісліцкі, І.Іяўлевіч, антычным вершам напісана паэма М.Гусоўскага «Песня пра зубра». *В.П.Рагойша.*

**АНТЫ́ЧНАЕ МАСТА́ЦТВА**, старажытнагрэчаскае і старажытнарымскае мастацтва (1-е тыс. да н.э. — 1-я пал. 1-га тыс. н.э.). Зарадзілася на Пд Балканскага п-ва, на астравах Эгейскага архіпелага і зах. узбярэжжы М.Азіі. Найвышэйшы росквіт перажыло ў *Грэцыі* Старажытнай. Падзяляецца на *архаіку* (7—6 ст. да н.э.), *класіку* (5—4 ст. да н.э.), *эліні́зм* (канец 4—1 ст. да н.э.), рымскае мастацтва (3 ст. да н.э. — 5 ст. н.э.). У эпоху эліні́зму яго ўплыў пашырыўся на тэрыторыі, што прылягалі да Міжземнага і Чорнага мораў, на Б. і Сярэдні Усход (амаль да Індыі), дзе склаліся мясц. школы *эліністычнага мастацтва*. Традыцыі стараж.-грэч. і эліністычнага мастацтва атрымалі новае развіццё ў мастацтве *Рыма* Старажытнага. Лепшыя творы А.м., якія ў класічна ясных, узнёслых формах увасобілі высокія гуманіст. ідэалы, да нашага часу звязаны з уяўленнем аб маст. дасканаласці і недасягальным узоры, гарманічным харастве па законах прастаты, раўнавагі, меры. *Я.Ф.Шункейка.*

Да арт. **Антычнае мастацтва.** Барацьба Зеўса з гігантамі. Фрагмент фрыза Пергамскага алтара. Каля 180 да н.э.

**АНТЫ́ЧНАСЦЬ** (ад лац. antiquus старажытны), тэрмін, які абазначае старажытнасць, даўніну; пераважна ўжываецца ў дачыненні да грэка-рымскай даўніны і ўсёй сукупнасці яе праяў. Ахоплівае перыяд з 9 ст. да н.э. да 476

н.э. (падзенне Зах. Рым. імперыі). Тэрмін «А.» сфарміраваўся ў эпоху *Адраджэння*, калі разам з абуджэннем цікавасці да грэка-рымскай культуры ўзніклі паняцці *антычнае мастацтва*, ант. л-ра, *антычная філасофія*, ант. гісторыя і інш. У ант. грамадстве нарадзіліся агульначалавечыя каштоўнасці, якія пазней вызначаны як *гуманізм, дэмакратыя, патрыятызм*. Тыповай формай ант. дэмакратыі сталі дзяржава-*поліс* у грэкаў і цывітас (гарадская абшчына) у рымлян (адсюль паходжанне слоў «цывільны», «цывілізацыя»). У А. расквітнелі розныя філас. сістэмы, развіваліся этыка, эстэтыка, гісторыя, тэатр, архітэктура і скульптура, асновай заканадаўства многіх краін стала антычнае права. Гуманіст. ідэі ант. культуры паўплывалі на развіццё культуры ўсіх еўрап. народаў, асаблівае месца ў навуцы заняла лац. мова. Больш падрабязныя і канкрэтныя звесткі пра А. гл. ў арт. *Грэцыя* Старажытная, *Рым* Старажытны, *Рабаўладальніцкі лад, Эліпізм* і інш.

*Літ.*: Античная цивилизация. М., 1973; Штаерман Е.М. Роль античного наследия в европейской культуре // История Европы. М., 1988. Т. 1. *К.А.Равяка.*

**АНТЫ́ЧНАЯ ФІЛАСО́ФІЯ**, сукупнасць філасофскіх вучэнняў старажытнагрэчаскага і старажытнарымскага грамадстваў у 7 ст. да н.э. — 6 ст. н.э. У сваім развіцці прайшла 4 перыяды: узнікненне і фарміраванне (канец 7—6 ст. да н.э.), росквіт (5—4 ст. да н.э.), пачатак заняпаду (3—1 ст. да н.э.), заняпад (1—5 ст. н.э.). Узнікла ў іанійскіх калоніях Стараж. Грэцыі ў выглядзе *натурфілософіі* і адлюстроўвала светапогляд прамыслова-гандлёвага класа. Адной з першых філас. школ была мілецкая (Фалес, *Анаксімандр, Анаксімен*), для якой характэрны стыхійны матэрыялізм, наіўная дыялектыка, наяўнасць элементаў міфалогіі, *антрапамарфізму* і *пантэізму*. Са стараж.-грэч. філосафам Гераклітам звязваюць першыя спробы выявіць адзіную аб'ектыўна-лагічную заканамернасць (дыялектыку) у любым працэсе. У перыяд яе росквіту сфарміраваліся Акадэмія Платона, Лікей Арыстоцеля. Філасофія стала навукова арыентаванай дысцыплінай са строга акрэсленымі прадметамі, логіка-гнасеалагічнымі прынцыпамі, катэгарыяльным апаратам, мэтамі і задачамі. Усебакова распрацаваны найважнейшыя часткі філасофіі — анталогія, гнасеалогія, вучэнне пра грамадства і дзяржаву, логіка, этыка, эстэтыка, псіхалогія, а таксама касмалогія, матэматыка і інш. прыродазнаўчыя дысцыпліны. У філасофіі аформіліся 2 асн. кірункі — матэрыялістычная лінія Дэмакрыта і ідэалістычная лінія Платона, дыялектычны (Геракліт) і метафізічны (элеяты) падыходы ў трактоўцы быцця. Страта грэч. гарадамі самастойнасці негатыўна паўплывала на культуру і філасофію. У 3—1 ст. да н.э. ў філасофіі прасочваюцца 3 гал. плыні — *скептыцызм, эпікурэізм* і *стаіцызм*. З агульнатэарэт. пытанняў (праблем быцця, гнасеалогіі, дзярж. ладу) акцэнт у іх перамясціўся ў бок пошукаў канкрэтных прынцыпаў асабістых паводзін, якія дазволілі б да́сягнуць шчасця асобнаму чалавеку. Сац.-эканам. і паліт. супярэчнасці Рымскай імперыі на пач. н.э. садзейнічалі пашырэнню рэліг. вучэнняў, пад уплыў якіх трапіла і філасофія. Рэліг. скіраванасцю характарызаваліся школы неапіфагарэізму і неаплатанізму, хоць у цэлым яны не прытрымліваліся афіц. ідэалогіі хрысціянства. У пач. 6 ст. н.э. дэкрэтам імператара Юсцініяна філас. школа платанізму ў Афінах закрыта. А.ф. — адзін з важнейшых этапаў развіцця філасофіі і філас. культуры. Яе заслуга ва ўсеабдымным і сістэматычным абгрунтаванні філасофіі як навук. тэорыі, развіцці сістэмы паняццяў, у распрацоўцы ці пастаноўцы ўсіх асн. філас. праблем.

*Літ.*: Антология мировой философии. Т. 1, ч. 1. М., 1969; Асмус В.Ф. Античная философия. 2 изд. М., 1976; Вернан Ж.-П. Происхождение древнегреческой мысли: Пер. с фр. М., 1988. *Т.І.Адула.*



Да арт. **Антычнасць**. Сход багоў. Размалёўка старажытнагрэчаскага келіха. Каля 510 да н.э.

**АНТЫ́ЧНЫ ТЭА́ТР**, паняцце, якое аб'ядноўвае тэатр *Грэцыі* Старажытнай і краін Б. Усходу, што развіваўся пад яго ўплывам, і тэатр *Рыма* Старажытнага. У перыяд развіцця А.т. (6 ст. да н.э. — 4—5 ст. н.э.) у Еўропе ўпершыню створана сапраўднае тэатр. мастацтва, узніклі першыя ўзоры пастаянных тэатр. збудаванняў (тэатр у Эпідаўры), тэатр. машын і дэкарацыйнага афармлення спектакляў. Вопыт і традыцыі А.т. маюць моцны ўплыў на тэорыю і практыку еўрап. т-ра новага часу.

**АНТЫ́ЧНЫЯ ЛІТАРАТУ́РЫ**, гл. раздзел Літаратура ў арт. *Грэцыя* Старажытная, *Рым* Старажытны.

**АНТЭ́Й**, у грэчаскай міфалогіі волат, уладар Лівіі, сын *Пасейдона* і *Геі*. Быў непераможны, пакуль дакранаўся да зямлі, якая давала яму новыя сілы. Загінуў у паядынку з Гераклам, які адарваў А. ад зямлі і задушыў. Гэты сюжэт адлюстраваны на франтоне храма Геракла ў Фівах, у шматлікіх жывапісных творах Л.Кранаха Старэйшага, Г.Бальдунга (Грына), Я.Тынтарэта, Дж.Цьепала і інш.

**«АНТЭ́Й»**, Ан-22, транспартны (грузавы) самалёт. Створаны ў 1964 у КБ сав. авіяканструктара А.К.Антонава. Мае 4 турбавінтавыя рухавікі магутнасцю 11 МВт кожны. Узлётная маса 250 т, скорасць 740 км/гадз, далёкасць палёту 5—11 тыс. км. Перавозіць груз да

Геракл і **Антэй**. Скульптурная група А.Палаёла. Каля 1475.

Да арт. **Антычны тэатр**. Старажытнагрэчаскі тэатр у Эпідаўры. Арх. Паліклет Малодшы. 350—330 да н.э.

80 т на адлегласць 5 тыс. км. На «А.» ўстаноўлена 15 сусв. рэкордаў.

**АНТЭ́Й**, позназімовы сорт яблыні селекцыі Бел. НДІ пладаводства. Раянаваны ў Беларусі.

Дрэва сярэднярослае, пладаносіць на 6—7-ы год пасля пасадкі. Крона круглавата-конусападобная, рэдкая. Лісце яйцападобнае, маршчыністае, даволі вялікае. Сорт скараплодны, ураджайны. Плады сярэднія і вялікія, круглавата-канічныя, крыху пляскатыя, часам шырокарабрыстыя, захоўваюцца да сярэдзіны красавіка. Скурка светла-зялёная з цёмна-бардовым адценнем. Мякаць белая з зеленаватым адценнем, сакаўная, кісла-салодкая. Сорт сярэднеўстойлівы да паршы, зімаўстойлівы.

**АНТЭКЛІ́ЗА** (ад *анты...* + грэч. klisis нахіл), вялікае скляпеннепадобнае падняцце паверхні крышт. фундамента ў межах *платформаў* (пліт); процілегласць *сінеклізы*.

Мае круглаваты або выцягнуты контур, памеры ў папярочніку да некалькіх соцень кіламетраў. Фарміруецца на працягу некалькіх геатэктанічных этапаў як зона павольнага падняцця зямной кары на фоне апускання сумежных структур. Таму на А. магутнасць платформавага чахла памяншаецца ад перыферыі да цэнтра, месцамі на зямную паверхню выходзяць пароды фундамента. На Рускай пліце Усходне-Еўрапейскай платформы вядомы *Беларуская антэкліза* (у цэнтр. і паўд.-зах. частках тэр. рэспублікі) і *Варонежская антэкліза* (зах. крыло — на У Беларусі).

*М.Н.Нагорны.*

**АНТЭ́МІС**, род кветкавых раслін, гл. *Пупок*.

**АНТЭ́НА** (ад лац. antenna рэя), прыстасаванне для выпрамянення і прыёму *электрамагнітных хваляў*; адзін з асн. элементаў ліній радыёсувязі. Перадавальная А. пераўтварае энергію эл.-магн. ваганняў, засяроджаную ў выхадных вагальных ланцугах радыёперадатчыка, у энергію радыёхваляў. Прыёмная А. выконвае адваротнае пераўтварэнне энергіі радыёхваляў у энергію ВЧ-ваганняў і аддзяляе карысны сігнал ад перашкод. У большасці перадавальных А. інтэнсіўнасць выпрамянення залежыць ад напрамку (накіраванасць выпрамянення), што павышае напружанасць эл.-магн. хвалі ў бок найб. выпрамянення (раўназначная эфекту, выкліканаму павышэннем выпрамяняльнай магутнасці); вызначаецца каэфіцыентам накіраванага дзеяння (КНДз). Залежнасць напружанасці эл. поля ад напрамку назірання графічна адлюстроўваецца дыяграмай накіраванасці (ДН). Звычайна ДН мае многапялёсткавы характар (вынік інтэрферэнцыі выпрамянення ад асобных элементаў А.); адрозніваюць гал. пялёстак і бакавыя. Чым большыя памеры А. ў параўнанні з даўжынёй хвалі, тым вузейшы гал. пялёстак, большы яго КНДз і большая колькасць бакавых пялёсткаў. Асн. характарыстыкі А. (ДН, КНДз і ўваходнае супраціўленне, што характарызуе ўзгадненне А. з лініяй перадачы) аднолькавыя ў рэжымах перадачы і прыёму. Паводле канструкцыі і прынцыпу работы А. бываюць: *бягучай хвалі антэна, дыяпазонная антэна, рамачная антэна, хваляводна-рупарная антэна, люстраная антэна*, вібратарная, шчылінная, лінзавая, антэнная рашотка і інш.

Антэй.

Самалёт «Антэй» (Ан-22).




Антэна лінзавая і яе дыяграмы накіраванасці (ДН).




Антэна вібратарная.

В і б р а т а р н а я А. — праваднік даўжынёй L = 0,5λ, дзе λ — даўж. хвалі; КНДз=1,64, для яго павелічэння звычайна выкарыстоўваюць многавібратарныя А. (гл. *Тэлевізійная антэна*); выкарыстоўваюць ва ўсіх дыяпазонах радыёхваляў. Ш ч ы л і н н а я А. — метал. экран з прамавугольнымі адтулінамі; выкарыстоўваюць у дыяпазоне ЗВЧ. Л і н з а в а я А. складаецца з абпрамяняльніка (вібратарная, шчылінная або інш. А.) і дыэлектрычнай лінзы, якая факусіруе хвалю ў вузкі прамень; КНДз да $10^4$; выкарыстоўваецца ў радыёлакацыйных і вымяральных установах. А н т э н н а я р а ш о т к а — сістэма слабанакіраваных А., якія ў рэжыме перадачы далучаюцца да агульнага генератара праз сістэму размеркавання магутнасці, у рэжыме прыёму — да агульнага прыёмніка; КНДз прыблізна роўны здабытку КНДз асобнага выпрамяняльніка і іх колькасці. Асаблівасць — магчымасць паварота ДН адносна самой рашоткі (эл. сканіраванне), што дасягаецца зменай рознасці фазаў паміж суседнімі выпрамяняльнікамі з дапамогай спец. фазавярчальнікаў па камандах ЭВМ.

*А.А.Юрцаў.*

**АНТЭ́НУЛЫ**, першая пара рухомых членістых прыдаткаў галавы ў ракападобных. Выходна простыя, у некаторых вышэйшых другасна разгалінаваныя на 2—3. Звычайна з'яўляюцца органамі дотыку і хемарэцэпцыі; у некаторых ніжэйшых ракаў ператвораны ў прыстасаванні для плавання (весланогія) або прымацавання да субстрату (вусаногія).

**АНТЭ́НЫ**, с я ж к і, в у с і к і, парныя шматчленістыя прыдаткі галавы членістаногіх (акрамя павукападобных). У насякомых А. розныя па форме (жгуцікападобныя, грабеньчатыя, пласціністыя, булавападобныя) і памерах; у ракападобных А. — другая за антэнуламі пара галаўных прыдаткаў. А. выконваюць функцыі органаў нюху, дотыку, смаку, слыху, успрымання т-ры, вільготнасці і нават святла (у тлі), зрэдку служаць для захопу здабычы, утрымлівання самкі (у самцоў весланогіх), пухіркоў паветра (у жукоў-серабранак), для руху (у галінаставусых) і інш.

**АНТЭРЫ́ДЫЙ** (ад грэч. anthēros квітнеючы), мужчынскі орган палавога размнажэння (мужчынскі *гаметафіт*) споравых раслін (моха- і папарацепадобных, некаторых водарасцяў) і грыбоў (ааміцэтаў і аскаміцэтаў). У вышэйшых раслін — невял. авальнае або шарападобнае цельца з покрывам з аднаго або некалькіх радоў бясплодных клетак. Унутры А. ўтвараюцца сперматагенныя клеткі, з іх потым узнікаюць мужчынскія гаметы — сперматазоіды, або спермацыі. У грыбоў змесціва А. не падзелена на асобныя гаметы.

**АНТЭСТЭ́РЫІ**, вясновае свята абуджэння прыроды ў Стараж. Афінах. Першы дзень наз. «днём адкрыцця бочак», другі дзень — «куфля», прысвячалі богу вінаробства *Дыянісу*. Трэці дзень свята («гаршкі») прысвячалі ду-

шам памерлых і выстаўлялі ім пачастункі.

**АНТЭФІ́КС** (лац. antefixum), від архітэктурнага аздаблення з мармуру ці тэракоты ў форме пальметы або шчыта з рэльефным арнаментам, з выявай фантаст. жывёліны. Звычайна размяшчаліся па краях дахавага накрыцця ўздоўж падоўжнай сцяны ант. храма.

**АНУ́БІС**, у егіпецкай міфалогіі першапачаткова бог смерці, пазней апякун памерлых, некропаля, пахавальных абрадаў і бальзаміравання. Уяўляўся ў вобразе ляжачага шакала чорнай масці або чалавека з галавой шакала. Стараж. грэкі атаясамлівалі А. з *Гермесам*.

**АНУ́Й**, Ануйль (Anouilh) Жан (23.6.1910, г. Бардо, Францыя — 3.10.1987), французскі драматург. У цэнтры яго камерных п'ес «Гарнастай» (1934), «Падарожнік без багажу» (1937), «Дзікунка» (паст. 1938) трагічны канфлікт героя з жорсткасцю навакольнага свету. Аўтар лірыка-іранічных камедый «Вячэра ў Санлісе», «Леакадзія» (абедзве 1942), «мудрагелістых п'ес» «Падвал» (1961), «Арышт» (1975) і інш., паліт. фарса «Дзівак, ці Закаханы рэакцыянер» (паст. 1959). У антыфаш. трагедыі «Антыгона» (паст. 1943), гіст. драмах «Жаваранак» (1953), «Бекет, ці Гонар Божы» (1959) паказана гібель маральна бескампраміснага героя, які адстойвае сваю чалавечую годнасць. П'есы А. вызначаюцца разнастайнасцю і навізной сюжэтаў, натуральнасцю дыялога, эмацыянальнасцю і гумарам.

*Тв.*: Le rendez-vous de Senlis; Leocadia. Paris, 1973; Рус. пер. — Пьесы. Т. 1—2. М., 1969.

**АНУЛЯ́ЦЫЯ**, анулявание (ад лац. annullo знішчаю), адмена, абвяшчэнне несапраўдным якога-н. акта, дагавора або правоў ці паўнамоцтваў. Гл. таксама *Дэнансацыя*.

**АНУПРЫЕ́НКА** Сяргей Пятровіч (н. 20.4.1954, г. Мінск), бел. філосаф. Канд. філас. н. (1985). Скончыў БДУ (1979). Працуе ў Ін-це філасофіі і права АН Беларусі. Распрацаваў цэласную тэарэтыка-метадалагічную канцэпцыю фарміравання эколагакаштоўнасных поглядаў чалавека ў сучасных умовах, праграму практычных мер па псіхарэабілітацыі насельніцтва, якое жыве на тэр. Беларусі, забруджанай радыенуклідамі. Даследуе праблемы экалагічнай адукацыі, нетрадыцыйных падыходаў у галіне псіхасац. развіцця чалавека.

*Тв.*: Экология в системе образования и просвещения Белоруссии: проблемы и перспективы. Мн., 1990; Социально-культурные аспекты экологических проблем в Беларуси. Мн., 1994.

**АНУ́РЫС**, Анхур, Інхар, у егіпецкай міфалогіі бог палявання, вайны. Цэнтр культу А. — г. Тыніс, дзе ён лічыўся тварцом сусвету. У міфах найчасцей выступаў як сонечны змеяборац.

**АНУРЫ́Я** (ад *ан...* + грэч. uron мача), поўнае спыненне выдалення мачы. Узнікае пры цяжкіх захворваннях нырак, закупорцы камянямі абодвух мачаточнікаў, сцісканні іх суседнімі пухлінамі, шоку і падзенні сардэчнай дзейнасці. Вядзе да *урэміі*. Патрабуе неадкладнага лячэння.

**АНУ́ФРЫЕЎСКІ МАНАСТЫ́Р**. Існаваў у канцы 14—19 ст. каля в. Сялец Мсціслаўскага р-на Магілёўскай вобл. Заснаваны як праваслаўны мсціслаўскім князем Лугвенам-Сімяонам, сынам вял. кн. ВКЛ Альгерда (паводле некат. звестак Юрыем, сынам Лугвена). У 1635 кароль Уладзіслаў IV перадаў манастыр грэка-каталіцкай царкве, яго настаяцелем быў архіепіскап смаленскі і северскі. Да 1809 манастыру належаў і фальварак. Усе манастырскія будынкі былі драўляныя, у апошняй трэці 18 ст. пабудаваны мураваныя царква св. Ануфрыя і жылы корпус. Б-ка А.м. мела 302 кнігі, у т.л. рукапісныя. Манастыр зачынены пасля скасавання Брэсцкай уніі (1839). Захавалася царква — помнік архітэктуры барока. Мураваны 1-нефавы храм з паўцыркульнай апсідай і высокай 5-яруснай чацверыковай вежай-званіцай. Цяпер прыходскі праваслаўны храм. *А.А.Ярашэвіч.*



Антэфікс.

Царква Ануфрыеўскага манастыра.

**АНУ́ФРЫЙ**, полацкі князь у ВКЛ. У грамаце, выдадзенай ім каля 1399 манастыру Іаана Прадцечы на валоданне

Ж.Ануй.

бортнымі землямі на азёрах Сомніца, Лісна і рэках Ула і Нача, назваў сябе вял. князем — адзіны выпадак, калі полацкі князь так тытулаваў сябе. Мяркуецца, што А. быў апошнім полацкім князем. *М.І.Ермаловіч.*

**АНУ́ЧЫН** Дзмітрый Мікалаевіч (27.8.1843, С.-Пецярбург — 4.6.1923), рускі антраполаг, географ, этнограф, археолаг. Акад. (1896), ганаровы чл. Расійскай АН (1898). Праф. (1884). У 1867 скончыў Маскоўскі ун-т і з 1885 узначальваў у ім кафедру геаграфіі. Па яго ініцыятыве ў 1879 пры ун-це створаны Музей антрапалогіі (з 1919 кафедра антрапалогіі, з 1922 НДІ антрапалогіі). Асн. кірунак даследаванняў А. — этнічная антрапалогія і антрапагенез, значная ч. прац прысвечана этнаграфіі, археалогіі, геамарфалогіі, гідралогіі і краязнаўству. Аўтар універсітэцкіх геагр. курсаў: «Гісторыя геаграфіі», «Агульная геаграфія» і інш. У 1890-я г. праводзіў геагр. экспедыцыі, вывучаў вытокі Зах. Дзвіны, Дняпра і інш. рэк. Удзельнічаў у рабоце Дзяржплана. Рэдагаваў часопісы «Этнографическое обозрение» (з 1889), «Землеведение» (засн. А. у 1894), «Русский антропологический журнал» (з 1900). У гонар А. названы: ледавік на в-ве Новая Зямля, гара на Паўн. Урале, в-аў і праліў у Малой Курыльскай градзе.

*Тв.*: Рельеф поверхности Европейской России в последовательном развитии о нем представлений. М., 1895; Труды экспедиции для исследования источников главнейших рек Европейской России. Вып. 61. М., 1897; К вопросу о белорусской территории // Курс белорусоведения. М., 1918—20.

**АНФА́С** (франц. en face літар. у твар), тварам да таго, хто глядзіць; від твару, прадмета прама, спераду.

**АНФІЛА́ДА** (франц. enfilade) у архітэктуры, шэраг паслядоўна прылеглых адно да аднаго памяшканняў, дзвярныя праёмы якіх размешчаны на

адной восі, што пры адчыненых дзвярах стварае скразную перспектыву ўсіх інтэр'ераў, звязаных у адзіную арх.-пластычную сістэму.

Анфіладная планіроўка ўзнікла ў Стараж. Егіпце. Пашырана ў архітэктуры стыляў рэнесансу, барока і класіцызму. У яе аснове — прынцып стварэння пышна аздобленых інтэр'ераў з эфектам бясконцасці, глыбокай перспектывы арх. прасторы (*Гальшанскі палац, Нясвіжскі палацава-паркавы комплекс, Жыліцкі палац* і інш.). У сучаснай архітэктуры выкарыстоўваецца ў буйных грамадзянскіх збудаваннях, пераважна музейных і выставачных (*Нацыянальны мастацкі музей Беларусі*, Палац мастацтваў у Мінску і інш.). А. называюць таксама шэраг прасторава раскрытых адна да адной плошчаў, якія ўтвараюць сістэму арх. ансамбляў (праспект Ф.Скарыны ў Мінску). *А.М.Кулагін.*

**А́НФІНСЕН** (Anfinsen) Крысціян Бемер (н. 26.3.1916, г. Манесен, шт. Пенсільванія, ЗША), амерыканскі біяхімік. Чл. Нац. АН ЗША (1963), Дацкага каралеўскага т-ва навук (1964). Скончыў Пенсільванскі ун-т (1939). У 1948—50 і 1962—63 выкладаў у Гарвардскім ун-це, у 1950—62 і з 1963 у Нац. ін-це здароўя ў Бетэсдзе (каля Вашынгтона). Навук. працы па біяхіміі бялкоў і ферментаў. Прапанаваў новую трактоўку працэсу біял. эвалюцыі (1959). Нобелеўская прэмія 1972 (з С.Мурам і У.Х.Стайнам).

*Тв.:* Молекулярные основы эволюции: Пер. с англ. М., 1962.

**АНХАЦЭ́РКА** (Onchocerca), род чарвей класа нематод. Выклікаюць *анхацэркозы*. Пашыраны ўсюды.

Цела нітка- ці воласападобнае, даўж. ў самцоў да 30 см, у самак да 1 м. Палаваспелыя паразітуюць у злучальных тканках, лічынкі (мікраанхацэркі) — у скуры. Для далейшага развіцця лічынкі павінны трапіць у мошак ці макрацоў. Праз 8—18 сутак мікраанхацэркі дасягаюць стадыі інвазійных лічынак. Развіццё паразіта адбываецца 7—8 мес. Жывёлы заражаюцца паблізу месцаў размнажэння.

**АНХАЦЭРКО́ЗЫ**, гельмінтозныя хваробы буйн. раг. жывёлы, коней, вярблюдаў, козаў, зрэдку чалавека, якія выклікаюцца нематодамі з роду *анхацэрка*. Пры А. назіраюцца пухліны з гноем, намулы, дэрматыты, кульгавасць і інш. Заражэнне адбываецца на забалочанай пашы і каля вады. Лячэнне растворам Люголя, хірургічнае.

Да арт. Анхацэркозы: 1 — фрагмент цела анхацэркі; 2 — інвазійная лічынка.

**А́НХЕЛЬ** (Ángel), Чурун-Мерун (Churún-Merún), вадаспад у Венесуэле, у вярхоўях р. Чурун (сістэма р. Карані), на Гвіянскім пласкагор'і. Самы высокі ў свеце: выш. падзення вады 1054 м (свабоднае падзенне 979 м). Адкрыты ў 1935 венесуэльскім лётчыкам Д.Анхелем.

Анфілада ў Жыліцкім палацы. Кіраўскі раён Магілёўскай вобл.

Вадаспад Анхель.

**АНХІМЮ́К** Вячаслаў Лявонцьевіч (н. 9.3.1915, г. Самарканд), вучоны ў галіне аўтаматычнага кіравання. Д-р тэхн. н. (1975), праф. (1977). Скончыў Сярэднеазіяцкі індустр. ін-т (1939), з 1946 выкладаў у гэтым ін-це. З 1960 у БПІ. Навук. працы па аптымізаваных сістэмах электрамеханікі, электрапрыводах робатаў на мікрапрацэсарнай аснове. Распрацаваў матэм. апарат (функцыі кіравання) для дыскрэтных электрамех. сістэм.

*Тв.:* Теория автоматического управления. М., 1979.

**АНХУ́ЗА**, род кветкавых раслін, гл. *Пакрывец*.

**А́НЦАЎ** Міхаіл Васілевіч (12.10.1865, Смаленск — 21.7.1945), бел. кампазітар, харавы дырыжор і педагог. Скончыў Пецярбургскую кансерваторыю (1894, клас кампазіцыі М.Рымскага-Корсакава). З 1896 жыў у Віцебску, выкладаў хар. спевы ў розных навуч. установах, рэдагаваў газ. «Витебские губернские ведомости» (1905—12). Адзін з арганізатараў нар. кансерваторыі (1918, чытаў у ёй лекцыі па гісторыі музыкі), кіраўнік Дзярж. хору. Майстар харавога пісьма, аўтар апрацовак бел. нар. песень («А ў полі вярба», «Кума мая, кумачка» і інш.), прасякнутых тонкім лірызмам рамансаў на вершы рус. паэтаў. З інш. твораў: кантата «Да стогадовага юбілею Пушкіна», гімн «У памяць стагоддзя Айчыннай вайны 1812 года», харавы «Рэквіем» («Не плачце над прахам забітых байцоў»). Напісаў шэраг вучэбных дапаможнікаў, метадычных работ, у т.л. «Нотная тэрміналогія. Даведачны слоўнік» (Віцебск, 1904). *С.Г.Нісневіч.*

**АНЦІМО́НАЎ** Леанід Сяргеевіч (н. 16.12.1934, в. Куляшы Сенненскага р-на Віцебскай вобл.), бел. графік, педагог. Скончыў Рыжскае вучылішча прыкладнога мастацтва (1955), мастацка-графічны ф-т Віцебскага пед. ін-та (1963); з 1964 выкладчык гэтага ін-та. Працуе ў розных графічных тэхніках, перавагу аддае манатыпіі, экслібрысу, гравюры. Кампазіцыі вылучаюцца складанай філас. трактоўкай вобраза, паэт. узнёсласцю, лірызмам, падкрэслена эксперым. характарам выяўленчай формы. Сярод работ: «Акно» (1974), «Кветка папараці» і «Мефістофель» (1978), «Дрэва жыцця» (1980), трыпціх «Зямля, Месяц, Сонца» (1986), «Ахвярапрынашэнне» (1991); цыклы работ «Успаміны пра вайну» (1976), «На купальскую ноч» (1978), «Твары і маскі» (1979), «Джаз» (1981), «Катастрофа» і «Людзі і птушкі» (1991). *М.Л.Цыбульскі.*

**АНЦІ́ПАЎ** Васіль Рыгоравіч (н. 15.2.1924, в. Бокачы Палкінскага р-на Пскоўскай вобл., Расія), дэндролаг. Д-р біял. н. (1981), праф. (1983). Скончыў Ленінградскую лесатэхн. акадэмію (1952). Працаваў у бат. садах Латвійскай і Беларускай АН, у Чарнавіцкім ун-це.

з 1977 праф. Бел. тэхнал. ун-та. Навук. працы па садова-паркавым і ландшафтным мастацтве, праблемах экалогіі.

*Тв.:* Парки Белоруссии. Мн., 1974; Устойчивость древесных растений к промышленным газам. Мн., 1979; Определитель древесных растений. Мн., 1994 (разам з І.В.Гуняжэнкам).

**АНЦІП'ЕЎ** Яфімка (Анціпін Яфрэмка), разьбяр па дрэве 2-й пал. 17 ст. Родам з Беларусі. Працаваў у Аружэйнай палаце Маскоўскага Крамля. Вучань *Іналіма*, пад кіраўніцтвам якога ўпрыгожваў (разам з Л.Юр'евым і Д.Грыгор'евым) царскую карэту «разнымі вуглавымі слупкамі» і гербамі; рабіў іканастасы, куфры, рызніцы, цацкі для царэвічаў і інш.

**«АНЦУЕ́ЛЯ»**, бел. нар. танец, разнавіднасць *кадрылі*. Назва паходзіць, верагодна, ад адной з размоўных формаў жаночага імя Ганна — Анця, Анцінея. Бытаваў на Навагрудчыне (зафіксаваны на пач. 19 ст.). Танцавалі ў 2 або 4 пары па чарзе, потым усе разам. Асн. элемент руху — галоп. Муз. памер 2/4. Тэмп хуткі. *Л.К.Алексютовіч.*

**АНЦЫ́ЛУС**, чашачка, шароўка (Ancylus), род прэснаводных *лёгачных малюскаў* класа бруханогіх з сям. катушак. 3—4 віды. Найб. вядомы А. рачны (A. fluviatilis). Пашыраны ў рэках Еўропы, Паўн. Афрыкі, Эфіопіі і Пярэдняй Азіі. На Беларусі трапляецца рэдка ў прыбярэжнай зоне рэк і некаторых азёраў (Нарач, Дрывяты) сярод зараснікаў водных раслін.

Цела ўкрыта шапачкападобнай з невысокай верхавінкай ракавінай (даўж. 5, выш. 4 мм). Мантыйная поласць рэдукаваная, ніжні край мантыі мае лопасцепадобны выраст, які функцыянуе як другасная шчэлепа (для А. характэрна вяртанне ад лёгачнага паветр. дыхання да воднага). Орган зроку каля асновы шчупальцаў. Корміцца водарасцямі, зялёнымі часткамі водных раслін. Удзельнічае ў біял. ачышчэнні вадаёмаў. Да роду А. адносілі і А. азёрнага (A. lacustris), які зараз вылучаны ў асобны род Acroloxus.

**А́НЦЫО** (Ancio), кліматычны курорт у Італіі. Каля 55 км на Пд ад Рыма, на беразе Тырэнскага м. Вядомы з часоў Стараж. Рыма. Мяккі міжземнаморскі клімат, шырокі пляж, працяглы перыяд марскіх купанняў. Музей тэрмаў, рэшткі рымскіх пабудоў.

**АНЦЫ́ПА** (Анцыпа-Чыкунскі) Ільдафонс Дзяменцьевіч (1815 ?, в. Мілавань каля Гродна — 6.6.1863), удзельнік рэв. руху на Беларусі і ў Польшчы. Вучыўся ў Слонімскім павятовым вучылішчы. Удзельнік паўстання 1830—31. У эміграцыі (Францыя) чл. Польскага дэмакр. т-ва, выступаў у друку па пытаннях арганізацыі ўзбр. паўстання. У час паўстання 1848 камандаваў сял. атрадам на Пазнаншчыне. У 1859 вярнуўся ў Расію, жыў пад наглядам паліцыі ў маёнтку брата на Быхаўшчыне. У час паўстання 1863—64 узначаліў паўстанцкі атрад у Быхаўскім пав. 28.4.1863 яго атрад разбіты. А. расстраляны ў Магілёве. *Г.В.Кісялёў.*

**АНЦЫРА́БЕ** (Antsirabe), горад у цэнтральнай ч. Мадагаскара. 91 тыс. ж. (1982). Шашэйная і чыг. сувязь з г. Антананарыву. Тэкст., харчасмакавая прам-сць. Цэментны з-д. Ювелірная вытв-сць. Цэнтр с.-г. раёна (рыс, агародніна, малочная жывёлагадоўля). Рэгіянальны універсітэцкі цэнтр. Балънеалагічны курорт.

**АНЧА́Р** (Antiaris), род кветкавых раслін сям. тутавых. 6 відаў. Растуць у тропіках Азіі, Афрыкі і на трапічных а-вах. Найб. вядомы А. ядавіты (A. toxicaria), або упас-дрэва з в-ва Ява.

Аднадомныя шматгадовазялёныя дрэвы або кусты. Лісце чаргаванае простае. Кветкі непрыкметныя, аднаполыя, мужчынскія ў невялікіх плоскіх галоўчатых суквецціях, жаночыя — адзіночныя беспялёсткавыя, з маленькай чашачкай. Плод складаны або зборны (суплоддзе) з мноствам дробных плодзікаў, якія шчыльна сядзяць і абгорнуты сакавітым каляквет нікам. Усе віды А. ядавітыя. У млечным соку А. ядавітага, які абарыгены выкарыстоўваюць для атручвання наканечнікаў

Анчар ядавіты.

стрэл, знаходзяцца ядавітыя гліказіды антыярын і антыязідзін. А. Бенета (A. bennettii) з в-ва Віты-Леву мае ў пладах кармінавую фарбу, у кары — лубяныя валокны; з валокнаў А. мяшочнага (A. saccodora) і А. цэйлонскага (A. ceylonica) вырабляюць мешкавіну. Сок і насенне розных відаў А. ўжываюць як ірвотны і слабіцельны сродак.

**АНЧО́УС**, еўрапейскі анчоус (Engraulis eucrasicholus), хамса, рыба атр. селядцападобных. Жыве ў водах Атлантычнага ак. ад Паўночнага м. да Біскайскага заліва.

Даўж. да 20 см, маса да 19 г. Цела цыгарападобнае, спінны плаўнік невялікі. Трымаецца чародамі. Робіць сезонныя і вертыкальныя сутачныя міграцыі. Корміцца планктонам. Палавой спеласці дасягае на 2-м годзе жыцця. Жыве да 4 гадоў. Мае прамысл. значэнне.

Анчоус.

**А́НЧЫКАЎ** Рыгор Аляксандравіч (н. 27.1.1914, с. Верхнія Цімярсяны Цыльнінскага р-на Ульянаўскай вобл.), бел. кампазітар. Скончыў Бел. кансерваторыю (1955). З 1939 у Сав. Арміі, з 1956 інструктар ЦК КПБ. У 1966—72

М.В.Анцаў.

маст. кіраўнік Бел. філармоніі. Працуе пераважна ў галіне камернай і хар. музыкі. Аўтар санаты для скрыпкі і фп., прэлюдый і варыяцый для фп., хароў на словы бел. паэтаў (А.Русака, М.Алтухова), рамансаў, апрацовак чуваш. нар. песень. *Дз.М.Жураўлёў.*

**АНШЛА́Г** (ням. Anschlag), спецыяльная аб'ява, што ўсе білеты на спектакль (паказ, канцэрт) прададзены. Паняцце А. тоесна паняццю «поўны збор».

**АНШЛІ́Ф** (ням. Anschliff), непразрысты кавалак мінералу, горнай пароды, руды, акамянеласці, вугалю або металу з адшліфаваннай і адпаліраванай адной або некалькімі паверхнямі. Выкарыстоўваецца для вызначэння мінералаў, вывучэння структуры рудаў і інш. у адлюстраваным святле палярызацыйнага мікраскопа.

**А́НШЛЮС** (ням. Anschluß літар. далучэнне), патрабаванне аб'яднаць Аўстрыю з Германіяй у адзіную дзяржаву ў праграмах часткі аўстр. і герм. паліт. сіл пасля 1-й сусв. вайны. Рэалізаваны ў 1938—45. Спробы А. былі ў 1918, 1931 і 1934. 12.11.1918 Часовы нац. сход Аўстрыі па ініцыятыве дэпутатаў ад сацыял-дэмакратаў О.Баўэра, В.Адлера, К.Рэнера і інш. самавольна абвясціў краіну састаўной часткай Герм. рэспублікі. Распачатая Баўэрам і яго паплечнікамі прапаганда А. не была падтрымана большасцю насельніцтва Аўстрыі. Баючыся ўзмацнення Германіі за кошт Аўстрыі, дзяржавы-пераможцы ў 1-й сусв. вайне забаранілі А. У сак. 1931 Германія і Аўстрыя падпісалі пагадненне аб мытным саюзе («халодны А.»). Пратэсты ўрадаў Вялікабрытаніі, Францыі, Італіі, Чэхаславакіі і Міжнар. суд у Гаазе прымусілі Германію і Аўстрыю адмовіцца ад пагаднення. Пасля прыходу да ўлады ў Германіі нац.-сацыялістаў (1933) і актывізацыі з іх боку

руху за А. аўстр. Хрысціянска-сацыяльная і Сацыял-дэмакр. партыі выключылі патрабаванні А. са сваіх праграм. У ліп. 1934 супраць намагання Гітлера прывесці да ўлады ў Вене мясц. нацыстаў і здзейсніць А. выступіў фаш. дыктатар Італіі Мусаліні. У канцы 1937 — пач. 1938 Гітлер, дамогшыся згоды Мусаліні і не сустрэўшы пярэчанняў з боку Вялікабрытаніі і ЗША, забяспечыў знешнепаліт. падтрымку А. У лют. 1938 ён прымусіў пайсці ў адстаўку аўстр. ўрад К.*Шушніга*. Прызначаны яшчэ гэтым урадам на 13 сак. плебісцыт праходзіў пад кантролем уведзеных у Аўстрыю 12.3.1938 герм. войскаў, што адбілася на яго выніках — 99% насельніцтва прагаласавалі за А. На пач. крас. 1938 Вялікабрытанія, Францыя, ЗША ліквідавалі свае дыпламат. місіі ў Вене, фактычна прызнаўшы А. У канцы

Да арт. Аншлюс. Войскі Германіі ўступаюць у Вену. 1938.

2-й сусв. вайны, пасля таго як тэр. Аўстрыі была занята войскамі краін антыгітлераўскай кааліцыі, прымусовы А.ануляваны і адноўлена незалежная аўстр. дзяржава (1945).

**А́НШУЦ** (Anschütz) Генрых (8.2.1785—29.12.1865), аўстрыйскі акцёр. Адзін з заснавальнікаў сцэнічнага рэалізму ў аўстр. т-ры. Працаваў у т-рах Германіі (Нюрнберг, Лейпцыг і інш.), з 1821 у «Бургтэатры» (Вена). Акцёр моцнага тэмпераменту, высокай культуры сцэнічнага слова. З аднолькавым поспехам выконваў камедыйныя і трагедыйныя ролі: Лір, Фальстаф («Кароль Лір», «Генрых IV» У.Шэкспіра), Антон («Марыя Магдаліна» К.Ф.Гебеля) і інш.

**АНЬХО́Й**, Аньхуэй, правінцыя на У Кітая, у нізоўях рэк Янцзы і Хуанхэ. Пл. каля 140 тыс. км². Нас. 56 млн. чал. (1990). Адм. ц. — Хэфэй. Гал. парты: Уху, Юйцыкоў, Банбу. На Пн — нізінная тэр. Вял. Кітайскай раўніны. Зах. і паўд. часткі — сярэдневышынныя горы (макс. выш. больш за 1800 м). Клімат субтрапічны мусонны. Сярэднія т-ры студз. ад 0 да +4 °С, ліп. 24—28 °С, ападкаў 600—1500 мм за год з летнім максімумам. Лясы хваёвыя і шыракалістыя. Бязлесная раўніна з урадлівымі карбанатнымі алювіяльнымі глебамі амаль цалкам распрацавана. Густая гідраграфічная сетка, аснову якой складае р. Хуанхэ з прытокамі, мноства дробных азёраў. Разбуральныя паводкі р. Хуанхэ ліквідаваны пры дапамозе пабудаваных вадасховішчаў. А. — адзін з асноўных с.-г. раёнаў краіны (рыс, чай, проса, тытунь, пшаніца, соя, батат, кукуруза, бавоўнік). Развіты свінагадоўля, развядзенне рыбы. Здабыча каменнага вугалю (Хуайнанскі бас.), жал. руды (у Данту), медзі (у Тунгуаньшані), серы, фасфарытаў. Прадпрыемствы па перапрацоўцы с.-г. сыравіны. Металургічная, маш.-буд., хім., папяровая прамысловасць.

**АНЬША́НЬ**, горад на ПнУ Кітая, у даліне р.Ляахэ, у правінцыі Ляанін. Каля 1,4 млн. ж. (1990). Трансп. вузел. Цэнтр здабычы жал. руды і чорнай металургіі (найбольшы ў краіне металургічны камбінат). Цяжкае машынабудаванне, нафтаперапр., хім., цэментны з-ды.

**АНЬЯ́ЛЬСКІ САЮ́З**, палітычная групоўка афіцэраў шведскай арміі (113 афіцэраў-дваран), якая выступіла ў 1788 супраць абсалютызму караля Густава III. 12.8.1788 у мяст. Аньяла (Паўд. Фінляндыя) яны склалі «Дэкларацыю аньяльскіх канфедэратаў», або «Умову фінскай арміі», дзе патрабавалі ад караля спыніць распачатую ім без згоды парламента вайну з Расіяй, уступіць з ёю ў перагаворы аб міры, вярнуцца да канстытуцыйнага праўлення; ч. афіцэраў дамаглася дзярж. аддзялення Фінляндыі ад Швецыі. Удзельнікі саюза ўступілі ў кантакт з рас. урадам. Не атрымаўшы падтрымкі ў Швецыі і Пецярбургу, А.с. распаўся восенню 1788, яго ўдзельнікі арыштаваны і асуджаны.

**АНЬЯ́Н**, стараж. горад, рэшткі якога захаваліся недалёка ад сучаснага г. Аньян (правінцыя Хэнань, Кітай); апошняя сталіца дынастыі Шан-Інь. Заснаваны Пань Гэнам у 14 ст. да н.э., разбураны ў 1027 да н.э. плямёнамі чжоў. Памеры горада каля 292 х 143 м, вонкавых умацаванняў, верагодна, не было. Раскопкамі выяўлены рэшткі палацаў, храмаў, магільныя скляпы іньскіх правіцеляў і знаці, шматлікія жытлы. Найб. цікавыя знаходкі ў царскіх пахаваннях, куды разам з царом хавалі яго світу з конямі, клалі пахавальныя прынашэнні.

**АНЭ́ЛІНА**, вёска ў Беларусі, у Серкавіцкім с/с Талачынскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр каап. прадпрыемства «Радзіма». За 18 км на ПнУ ад г. Талачын, 122 км ад Віцебска, 23 км ад чыг. ст. Талачын. 270 ж., 114 двароў (1995). Базавая школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі.

**АО́МАРЫ**, горад у Японіі, на Пн в-ва Хонсю. Адм. ц. прэфектуры Аомары. 288 тыс. ж. (1990). Порт у аднайм. бухце (праліў Цугару). Падводным тунэлем і чыг. паромам злучаны з в-вам Хакайда. Лесапрамысл. і гандл. цэнтр. Дрэваапр., цэлюлозна-папяровая, рыбаперапр. прам-сць. Рамёствы (лакавыя і бамбукавыя вырабы).

**АО́РТА** (грэч. aortē), у чалавека галоўная *артэрыя* вялікага круга кровазвароту, што выносіць кроў з левага жалудачка сэрца. Каля выхаду з яго А. наз. ўзыходнай (даўж. яе каля 6 см), потым утварае дугу А., пераходзіць у сыходную А., праходзіць уздоўж пазваночніка праз грудную і брушную поласці. У млекакормячых жывёл і чалавека існуе левая дуга А., у птушак — правая. У рыб ад брушной А. адыходзяць шчэлепныя артэрыі. Яны падзяляюцца на капіляры, з якіх кроў цячэ ў 2 прадаўтаватыя ствалы — карані спінной А.; абедзве зліваюцца ў няпарную спінную А.

**АО́РЫСТ** (грэч. aoristos), простая дзеяслоўная форма, уласцівая многім стараж. і некаторым сучасным індаеўрап. мовам. Абазначае адзінкавае мінулае дзеянне (стан) без паказу яго працягласці. У старабел. літ. мове А. ужываўся рэдка. Утвараўся ад асновы інфінітыву пры дапамозе суфіксаў -х-, -с-, -ш- («быхъ, бы, бы, быхомъ, бысте, быша» — «я, ты, ён быў; мы, вы, яны былі»). У сучаснай бел. мове не захаваўся,

але форма 2-й і 3-й асобы адз. л. А. дзеяслова «быти» ператварылася ў нязменную часціцу «бы» («б») і служыць сродкам перадачы мадальнасці («меў бы», «калі б»).

**АПА**... (ад грэч. apo з, ад, без), першая састаўная частка складаных слоў, якая абазначае адмаўленне, страту, адсутнасць чаго-н., паходжанне з чаго-н., выдаленне, напр., *апагамія, апаміксіс.*

**А́ПА** (Apo), дзеючы вулкан на в-ве Мінданао, у Азіі. Выш. 2954 м (самы высокі на Філіпінах). Складзены з андэзітаў, знаходзіцца ў сальфатарнай стадыі (гл. *Сальфатары*). Укрыты трапічнымі, мяшанымі лясамі, хмызнякамі; каньёны, вадаспады, тэрмальныя крыніцы. Нац. парк Маўнт-Апа (пл. 72,9 тыс. га, засн. ў 1936).

**АПАБІЯСФЕ́РА** (ад *апа*... + *біясфера*), слаі *атмасферы* (вышэй за 60—80 км), у якія ніколі, нават выпадкова, натуральным шляхам не падымаюцца жывыя арганізмы і куды біягенныя рэчывы заносяцца толькі ў вельмі невял. колькасці. Структурная частка *мегабіясферы.*

**АПАВЯДА́ЛЬНЫ СКАЗ**, камунікатыўна-сінтаксічная адзінка мовы, у якой рэчаіснасць адлюстроўваецца ў выглядзе паведамлення. Асн. прызначэнне А.с. — несці інфармацыю (гэтым ён процілстаўляецца *пытальнаму сказу* і *пабуджальнаму сказу*). А.с. ўласціва складаная сістэма сродкаў перадачы паведамляльнага значэння: інтанацыя, фразавы (лагічны) націск, парадак слоў, марфал. катэгорыі (асабліва катэгорыі часу і абвеснага ладу дзеяслова), службовыя словы і інш. Структурныя схемы А.с. разнастайныя: ад аднаслоўных сказаў да канструкцый самай складанай пабудовы. *А.Я.Міхневіч.*

**АПАВЯДА́ННЕ**, невялікі празаічны (часам вершаваны) твор; жанр эпічнай л-ры (гл. *Эпас*). Звычайна ў яго аснове адна жыццёвая сітуацыя, падзея, эпізод, творам гэтага жанру характэрны адна сюжэтная лінія, невял. колькасць дзейных асоб. Генетычна А. звязана з жанрамі вуснай паэт. творчасці: казкай, анекдотам, паданнем і інш. Паводле характару адлюстравання рэчаіснасці і выяўлення асобы аўтара вылучаюць А. бытавое, сатыр., псіхал., лірычнае і г.д.

Шырока вядомы А.: Дж.Бакачыо ў італьянскай л-ры, М.Сервантэса ў іспанскай, Гі дэ Мапасана, П.Мерымэ, Стэндаля ў французскай, О.Генры, У.Фолкнера, Э.Хемінгуэя ў амерыканскай, С.Моэма ў англійскай, Р.Акутагавы ў японскай, А.Пушкіна, М.Гогаля, І.Тургенева, Л.Талстога, А.Чэхава, М.Горкага, І.Бабеля, М.Зошчанкі, М.Прышвіна, Ю.Нагібіна, В.Шукшына ў рускай. Першыя ўзоры бел. А. стварылі А.Плуг («Кручаная баба», нап. 1849), Ф.Багушэвіч («Тралялёначка», апубл. 1892). Напачатку А. мела рысы жанравай замалёўкі, быт. жарту, анекдота (Ядвігін Ш.). Паступова яно пазбаўлялася бытавізму, набывала моцнае сац. гучанне («Прысяга над крывавымі разорамі» Цёткі). Я.Колас стварыў першыя ў бел. л-ры алегарычна-філас. А. («Казкі жыцця»). У жанры А. паспяхова працавалі Ц.Гартны, М.Зарэцкі, К.Чорны, З.Бядуля, П.Галавач, Э.Самуйлёнак. Сучаснае А. звязана з імёнамі М.Лынькова, Я.Брыля, В.Быкава, І.Мележа, Я.Скрыгана, У.Караткевіча, А.Кулакоўскага, І.Шамякіна, А.Чарнышэвіча, М.Стральцова, І.Пташнікава, В.Адамчыка, Б.Сачанкі, І.Чыгрынава і інш.

*Літ.*: Беларуская савецкая проза: Апавяданне і нарыс. Мн., 1971. *С.А.Андраюк.*

**АПАГАМІ́Я** (ад *апа*... + ...*гамія*), а п а г а м е т ы я, адна з формаў бясполага размнажэння (*апаміксісу*) у вышэйшых раслін. Пры А. зародак утвараецца з клетак зарастка (у папарацяў) або зародкавага мяшка (у кветкавых раслін). Трапляецца рэдка (напр., у трыпутніка ланцэталістага).

**АПАГЕ́Й** (ад *апа*... + грэч. gē Зямля), 1) пункт арбіты Месяца ці штучнага спадарожніка Зямлі, найб. аддалены ад цэнтра Зямлі; процілеглы *перыгею*). У астраноміі тэрмін «А.» адносіцца толькі да целаў, што рухаюцца па замкнёных арбітах вакол Зямлі. 2) У пераносным сэнсе А. — найвышэйшая ступень, найб. ўздым, росквіт дзейнасці, творчасці, славы.

Ападкамер Траццякова.

## АПАДКІ 411

**АПАДКАМЕ́Р**, прылада для вымярэння колькасці і інтэнсіўнасці ападкаў. Уяўляе сабой дажджамернае вядро прыёмнай плошчай 200 см$^2$ з ахоўнай планкавай агароджай. Устанаўліваецца на выш. 2 м над зямлёй. Назіранні вядуцца 2 разы ў суткі і пасля ападкаў. Выкарыстоўваюцца таксама сумарны А. — цыліндр, у якім вада пакрываецца плёнкай тэхн. масла, каб пазбегнуць выпарэння, і А. з тэрмастатамі (цвёрдыя ападкі пераводзіць у вадкія).

**АПА́ДКІ АТМАСФЕ́РНЫЯ**. Выпадаюць з воблакаў (дождж, імжа, снег, крупы снежныя і ледзяныя, снежныя зерні, ледзяны дождж і град) або асядаюць на зямной паверхні ў выніку кандэнсацыі вадзяной пары ці замярзання пераахаладжаных кропляў вады (раса, шэрань, галалёд, іней). Адрозніваюць паводле характару выпадзення. Абложныя выпадаюць са слаіста-дажджавых і высокаслаістых воблакаў, звычайна звязаны з цёплым фронтам, працяглыя, ахопліваюць вял. плошчу. Ліўневыя выпадаюць з кучава-дажджавых воблакаў, прымеркаваны да халоднага фронту, непрацяглыя, з раптоўным пачаткам і канцом, зменлівай інтэнсіўнасці. Імжыстыя выпадаюць са слаістых і маламагутных слаіста-дажджавых воблакаў.

А.а. — адно са звёнаў кругавароту вады ў атмасферы. Колькасць ападкаў вымяраецца вышынёй слоя вады ў міліметрах, які ўтварыўся на гарыз. паверхні пры адсутнасці выпарэння і інш. страт. Гадавая сума А.а. на Зямлі ў сярэднім 1130 мм (больш за 500 тыс. км$^3$ вады). Размеркаванне ападкаў на Зямлі вельмі нераўнамернае, яно залежыць ад агульнай *цыркуляцыі атмасферы* і асаблівасцяў подсцільнай паверхні. Асаблівы ўплыў на размеркаванне А.а. мае рэльеф. Пэўная за-



нальнасць размеркавання парушаецца мясц. фактарамі. Найбольш вільготная на Зямлі экватарыяльная зона, дзе выпадае ад 3000 мм на Амазонскай нізіне ў Паўд. Амерыцы да 9655 мм на наветраных схілах масіву Камерун у Афрыцы. У тропіках выпадае ў сярэднім 1000—2000 мм за год (на сушы больш, чым у моры). Максімальная колькасць А.а. назіраецца ў зоне трапічных мусонаў на плато Шылонг у Індыі, дзе на выш. 1300 м у Чэрапунджы выпадае 10 902 мм А.а. за год. Прыкладна столькі ж (у асобныя гады) на наветраных схілах гор у зоне пасатаў на Гавайскіх а-вах. Мінімум А.а. у пустынях, дзе выпадае 50—250 мм і менш (у некаторых пунктах на сярэднім Ніле і ў пустыні Атакама ў Чылі А.а. не бывае па некалькі гадоў).

На тэр. Беларусі А.а. прыносяць *цыклоны* з Атлантычнага ак. і Міжземнага м., частка іх фарміруецца як мясцовыя ў выніку *канвекцыі*. За год выпадае ад 540 мм і менш (на Палессі) да 769 мм (на Навагрудскім узвышшы). Максімальная колькасць 1115 мм назіралася ў 1906 (Васілевічы), мінімальная 299 мм — у 1963 (Брагін). У сярэднім за год бывае ад 145 дзён з ападкамі (на ПдУ) да 195 дзён (на З і ўзвышшах Беларускай грады). Працягласць А.а. за год у сярэднім складае ад 1000—1200 гадзін (на Пд і З) да 1300—1500 гадз (на ПнУ рэспублікі). Максімальная працягласць за год 2034 гадз адзначана ў 1980 у Мінску.




Літ.: Швер Ц.А. Закономерности распределения количества осадков на континентах. Л., 1984; Атмосфера: Справ. Л., 1991; Климатические характеристики земного шара. Л., 1977; Климат Минска. Мн., 1976.

*В.Р.Жумар.*

**АПАЗІ́ЦЫЯ** (ад лац. oppositio процістаўленне, пярэчанне), 1) супраціўленне, нязгода, процідзеянне, процістаўленне адных поглядаў, палітыкі інш. поглядам, палітыцы. 2) Агульная назва партый, арг-цый, грамадскіх рухаў і аб'яднанняў, дзейнасць і погляды якіх процістаўлены поглядам большасці або пануючай думцы. Існуе ў парламентах, партыях. Парламенцкая А. складаецца з партый і паліт. груп, якія не маюць большасці месцаў у парламенце і не ўдзельнічаюць у фарміраванні ўрада. Па шэрагу пытанняў выступае супраць палітыкі ўрада, з крытыкай яго дзеянняў. Можа фарміраваць ценявы кабінет міністраў на выпадак прыходу да ўлады. Унутрыпартыйная А. — парт. групоўкі, якія па некаторых прынцыповых пытаннях палітыкі партыі выступаюць са сваім пунктам гледжання і праграмай дзеяння, супрацьстаяць прынятаму большасцю курсу партыі, яе кіраўніцтву. Можа разглядацца як аснова для ўтварэння новай партыі. А. — неабходная ўмова мірнага, здаровага развіцця грамадства. У бел. парламенце ўпершыню пра ствараннне А. абвешчана ў 1990 на 1-й сесіі Вярх. Савета Беларусі, дзе ў А. да палітыкі ўрада выступілі Бел. нар. фронт «Адраджэньне», Аб'яднаная дэмакр. партыя Беларусі, Бел. сац.-дэмакр. грамада і інш. Прадстаўнікі А. прымаюць удзел у заканатворчым працэсе, прапануюць шляхі ўмацавання суверэнітэту, незалежнасці дзяржавы, паглыблення рынкавых адносін, духоўнага адраджэння і кансалідацыі нацыі і інш.

*В.І.Семянкоў.*

**АПАЗІ́ЦЫЯ** ў моўназнаўстве, фармальнае адрозненне моўных адзінак, якому адпавядае адрозненне ў семантыцы. Так, бел. словы «лес» і «лёс» адрозніваюцца гукамі [э] і [о], што сігналізуе пра розніцу ў значэнні. У граматыцы семантычнае адрозненне рэалізуецца ў супрацьпастаўленні формаў (напр.: 'цяперашні час' і 'прошлы час' — «будуе» і «будаваў»); наяўнасць А. — абавязковая ўмова існавання граматычнага значэння. У лексіцы А. семантычных кампанентаў рэалізуецца ў лексемах (напр.: «прыйсці» — 'пачаць знаходзіцца' і «пайсці» — 'перастаць знаходзіцца' ў пэўным месцы). Упершыню паняцце А. распрацавана М.С.Трубяцкім.

*А.А.Кожынава.*

**АПАЗНАВА́ЛЬНЫЯ ЗНА́КІ**, адзнакі на транспартных сродках, ваен. тэхніцы і ўзбраенні. Вызначаюць іх дзярж. прыналежнасць, прызначэнне, дачыненне да аб'яднанняў, відаў і родаў войскаў і інш. Складаюцца з сімвалаў, літар, лічбаў, спец. знакаў і іх камбінацый.

А.з. лятальных апаратаў (ЛА) вызначаюцца Міжнар. арг-цыяй грамадз. авіяцыі (ІКАО). Звычайна складаюцца з пач. літар назвы дзяржавы і лічбавага знака, які прысвойваецца ЛА пры занясенні ў рэестр грамадз. паветр. суднаў дзяржавы. Наносяцца на крылы, бакавыя паверхні фюзеляжа, кіль. Ваен. самалёты і верталёты маюць А.з. ў выглядзе геам. фігур (кругоў, квадратаў, палос, зорак, крыжоў і інш.). Напр., А.з. ЛА Германіі — чорны крыж і выява дзярж. сцяга; Японіі — чырвоны круг; ЗША — белая пяціканцовая зорка. А.з. караблёў і суднаў (у т.л. ваен.) — выява дзярж. сцяга і бартавы нумар (вялікія караблі маюць таксама ўласную назву). А.з. ўзбраення і ваеннай тэхнікі, іх прыналежнасці да віду ўзбр. сіл, роду войскаў (службы) маюць большасць дзяржаў. А.з. прыналежнасці да аб'яднання, злучэння і інш. ўключаюць іх эмблемы і групу лічбаў, іншыя А.з. — спец. каляровыя знакі ў выглядзе палос, рысункаў, геам. фігур і г.д. На грамадз. трансп. сродках наносяцца міжнар. А.з. (гл. табл.).

Ва Узбр. Сілах Рэспублікі Беларусь А.з. — круг, падзелены гарызантальнай лініяй. У верхняй палове круга літары

**Міжнародныя апазнавальныя знакі на аўтамабілях**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Аргенціна | RA | ЗША | USA | Расія | ROS |
| Аўстрыя | A | Ізраіль | IL | Румынія | RO |
| Балгарыя | BG | Індыя | IND | Турцыя | TR |
| Беларусь | BY | Іспанія | E | Украіна | UA |
| Бельгія | B | Італія | I | Фінляндыя | SF |
| Бразілія | BR | Канада | CON | Францыя | F |
| Венгрыя | H | Кітай | TJ | Чэхія | CZ |
| Вялікабрытанія | GB | Латвія | LR | Швейцарыя | CH |
| Германія | D | Нарвегія | N | Швецыя | S |
| Данія | DK | Партугалія | P | Югаславія | YU |
| Егіпет | ET | Польшча | PL | Японія | J |

МА, знізу — выява дзярж. сцяга. На аўтамабілі, матацыклы, прычэпы таксама наносяцца: чырвоны крыж — на санітарныя машыны; Т — на машыны трансп. групы; ВАІ — на аўтамабілі і матацыклы ваен. аўтаінспекцыі і інш.



**Апазнавальныя знакі** на ваенных самалётах: 1 — Вялікабрытаніі; 2 — ЗША; 3 — Італіі; 4 — Кітая; 5 — Фінляндыі; 6 — Францыі; 7 — ФРГ; 8 — Японіі.

**Апазнавальныя знакі** (эмблемы) на трубах гандлёвых суднаў: 1 — Вялікабрытаніі (кампанія «Рабінзон энд Сан»); 2 — Галандыі («Конінклійке»); 3 — ЗША («Мобіл Ойл»); 4 — Італіі («Адрыятыка Сасьетэ»); 5 — Канады («Уэстэрн Канада Стымшып»); 6 — Турцыі («Дэнезчылык Банкасы»); 7 — ФРГ («Ханза»); 8 — Японіі («Таё Каюн Сангуо»).

**Апазнавальныя знакі** авіяэскадрылляў. Тактычных знішчальных: 1—2 — Вялікабрытаніі; 9—12 — ЗША; знішчальных: 3—4 — Вялікабрытаніі; 5—8 — Францыі («Эльзас», «Іль дэ Франс», «Нармандыя—Нёман», «Ларэн»).

**АПАКАЛІПСІС** (грэч. apokalypsis літар. адкрыццё), 1) адна з кніг *Новага Запавета* (Адкрыццё святога Іаана Багаслова). Напісана ў 68 — пач. 69 н.э. Іаанам Багасловам. У ёй у форме бачанняў, пасланых Богам, апісаны будучы лёс свету і чалавецтва. Гал. ідэя А. — чаканне страшнага Божага суда, калі на грэшнае чалавецтва абрынуцца сусв. катастрофы. Рэлігійна арыентаваныя тлумачальнікі разглядаюць А. як прарочую кнігу пра апошнія часы свету і здарэнні, што павінны адбыцца напярэдадні 2-га прышэсця Хрыста на зямлю. Праз увесь яго тэкст праходзіць сакральная лічба 7 (7 цэркваў, 7 зорак у руцэ Бога, 7 анёлаў, што выліваюць на грэшнікаў 7 чашаў Божага гневу, і г.д.). Сяміразовае памнажэнне бедстваў і катастрофаў прызначана выклікаць у чытача свяшчэнны жах перад непазбежным сканчэннем свету. Пасля Чарнобыльскай катастрофы шматлікія тлумачальнікі апакаліптычных прароцтваў, у т.л. на Беларусі, пачалі звязваць трубныя гукі трэцяга анёла, што апавяшчае аб падзенні на зямлю вялікай зоркі пад назвай «палын» (па-ўкраінску «чарнобыль»), з біблейскім прадказаннем гэтай самай згубнай у гісторыі чалавецтва катастрофы — нац. трагедыі бел. народа. Акрамя інтэрпрэтацыі А. як страшнага суда і канца свету яго яшчэ тлумачаць як абяцанне тысячагадовага шчасця пасля такога суда. 2) У шырокім сэнсе А. — буйнамаштабнае бедства, пагроза пагібелі чалавецтва, культуры, навакольнага асяроддзя. А. часта асацыіруецца з крызісам або канцом цывілізацыі, эканам. катастрофамі, ядз. вайной.

*Літ.*: Бабосов Е.М. Катастрофы: социол. анализ. Мн., 1995. *Я.М.Бабосаў.*

**АПАКРЫ́ННЫЯ ЗАЛО́ЗЫ** (ад грэч. apokrinō аддзяляю), залозы, у якіх пры ўтварэнні і выдзяленні сакрэту адрываюцца верхавінкавыя часткі залозістых клетак. Утвараюцца з эпітэліяльных зачаткаў, з якіх узнікаюць тлушчавыя залозы і валасы. У большасці млекакормячых размешчаны ў абваласелай скуры і некаторых інш. месцах. У чалавека і вышэйшых лакалізаваны ў падпахавых упадзінах, вонкавым слыхавым канале, каля грудных сасконаў, лабка, ануса, палавых органаў; разам з узбуйненымі тлушчавымі залозамі ўтвараюць *пахучыя залозы*. Спецыялізаваныя А.з. — *малочныя залозы*. Канчатковае развіццё і пачатак сакраторнай дзейнасці А.з. у чалавека супадаюць з палавым выспяваннем. Існуе цесная сувязь паміж А.з. і перыядамі палавога развіцця (менструацыя, цяжарнасць, клімактэрый); фізіялагічная дзейнасць згасае ў старэчы перыяд. Сакрэт А.з. мае рэчывы, што абумоўліваюць пах, спецыфічны роду, віду, індывідууму. У жывёл з'яўляецца сродкам абароны, пошуку, пазначэння тэрыторыі, прывабліванне

асобін процілеглага полу, а таксама ідэнтыфікацыі асобін. *А.С.Леанцюк.*

**«АПАКРЫ́СІС»**, Апокрысіс, «Апокрисис, албо отповедь на книжкы о съборе Берестейском...», помнік стараж. бел. пісьменства; твор *царкоўнапалемічнай літаратуры*. Апубл. ў 1597 у Вільні на польск. мове, перавыд. у 1598 у Астрозе ў перакладзе на старабел. мову. Аўтар (мяркуюць — валынскі пратэстант Марцін Бранеўскі) па даручэнні кн. Канстанціна Астрожскага выступіў у абарону нац.-рэліг. незалежнасці праваслаўных Украіны і Беларусі пасля *Брэсцкай уніі 1596* і ў адказ на кнігі яе апалагетаў П.*Скаргі* і І.*Пацея*, схаваўшыся пад псеўданімам Хрыстафор Філалет. Аўтар паказаў, што царк. саюз уніяцкіх і каталіцкіх епіскапаў абумоўлены не праблемамі багаслоўскай ісціны і маралі, а імкненнем да гарантаваных матэрыяльных выгод, высокіх дзярж. пасад, рэліг. прывілеяў і паліт. правоў. У «А.» выкарыстаны шырокі арсенал літ. і фальклі. мастацкіх сродкаў: анекдатычныя гісторыі, байкі, сатыр. бытавыя замалёўкі, трапныя прыказкі і прымаўкі, каларытныя эпітэты і параўнанні. «А.» — яркая старонка антыуніяцкай публіцыстыкі. Ён адыграў значную ролю ў кансалідацыі ўкр. і бел. народаў у іх барацьбе за нац.-культ. самабытнасць. Раскрыўшы востру супярэчнасць паміж феад. вярхамі двух асн. веравызнанняў Рэчы Паспалітай, аўтар змагаўся за традыцыі і веру народа з пазіцый мясц. знаці, якая баялася, каб палітыка уніяцка-каталіцкага духавенства не прывяла дзяржаву да ўнутр. сац. і нац.-вызв. вайны. Таму ён заклікаў знаць да салідарнасці і сумесных дзеянняў.

*Літ.:* Яременко П.К. Український письменник-полемист Христофор Філалет і його «Апокрисис». Львів, 1964. *А.Ф.Коршунаў.*

**АПА́Л** (лац. opalus), мінерал падкласа гідраксідаў, $SiO_2 \cdot nH_2O$. Мае 1—34% вады, 65—92% $SiO_2$. Прымесі аксідаў Al, Fe, Mn, Mg і інш. Разнавіднасці: каштоўны А., паўапал, гейзерыт, гідрафан і інш. Аморфны. Утварае нацечныя агрэгаты — аалітыскарынкі, ныркападобныя масы. Бясколерны, белы, жоўты, буры, чырвоны, зялёны. Для паўпразрыстых рознасцяў характэрна апалесцэнцыя. Бляск шкляны, радзей перламутравы, васковы. Цв. 5—6,5; вельмі крохкі. Шчыльн. 1,9—2,3 г/см$^3$. Асадкавы, гідратэрмальны. На Беларусі трапляецца ў выглядзе цэменту, шкарлупін дыятамей, у мелавых адкладах (сцяжэнні) і інш. Каляровыя (з ірызацыяй) А. — вырабныя камяні. Высакародны А. (вогненны) — каштоўны камень. З А. складаюцца дыятаміт, трэпел і апока — сыравіна для цэменту, напаўняльнікі і інш.

Апал.

**АПАЛАГЕ́ТЫКА** (ад грэч. apologētikos абараняльны), 1) раздзел хрысц. багаслоўя, які пры дапамозе аргументаў, звернутых да розуму і свядомасці чалавека, адстойвае веравучэнне; у вузкім сэнсе — гал. багаслоўе, грунтоўная тэалогія. Асновы А. закладзены ў 2—3 ст. Юсцінам, Тацыянам, Арыгенам, Тэртуліянам і інш. для абароны хрысціянства ад іудзейства, «язычніцтва» (пад ім разумелася ант. філасофія), дзярж. улад, ерасяў. Пашырана гал. чынам у праваслаўі і каталіцызме. Змест А. — інтэрпрэтацыя сутнасці рэлігіі, абвяржэнне накіраваных супраць яе абвінавачванняў, абгрунтаванне перавагі той ці інш. канфесіі. Апелюючы да розуму, А. ўсё ж лічыць, што нават лагічна абгрунтаваная сістэма догматаў павінна прымацца на веру, бо апошняя ў тэалогіі вышэйшая за розум. 2) У пераносным сэнсе А. — прадузятая абарона, тэндэнцыйнае ўсхваленне чаго-небудзь, каго-небудзь. *А.А.Цітавец.*

**АПАЛАДО́Р** (Apollodōros) з Дамаска, старажытнарымскі архітэктар і інжынер пач. 2 ст. Пабудаваў грандыёзны ансамбль форума Траяна ў Рыме (111—114), будынкі бібліятэк і знакамітую калону Траяна, абвітую стужкай рэльефаў на тэму паходу Траяна ў Дакію. А. прыпісваюць аркі Траяна ў гарадах Анкона (пасля 115) і Беневента. Сярод работ, якія не захаваліся, — мост цераз Дунай каля г. Дробета (цяпер у Румыніі), адэон, цырк і тэрмы Траяна ў Рыме.

**АПАЛА́ЧСКАЕ ПЛАТО́**, заходняе перадгорнае плато ў сістэме Паўд. Апалачаў, у ЗША (на Пд наз. плато Камберленд). Даўж. каля 1500 км. Выш. ад 500 м на З да 1500 м на ПнУ, дзе А.п. набывае характар гор (Алеганы). Складзена пераважна з вапнякоў. Глыбока расчляненае рэкамі сістэмы Агайо. Пашыраны карставыя формы рэльефу (славутая *Мамантава пячора*). Буйныя радовішчы каменнага вугалю. Шыракалістыя лясы.

**АПАЛА́ЧСКАЯ СКЛА́ДКАВАЯ ВО́БЛАСЦЬ**, зона палеазойскай складкавасці ўздоўж паўд.-ўсх. ускраіны *Паўночна-Амерыканскай платформы*. Сфарміравалася ў выніку праяўлення таконскай (сярэдні ардовік — сілур), акадскай (ранні — сярэдні дэвон) і алеганскай (карбон — ранняя перм) фазаў складкавасці. З канца палеазою і ў мезазоі падвяргалася моцнай эрозіі, у позняй юры перакрывалася морам, на працягу мелавога перыяду і кайназойскай эры паўторна спадзіста прыўзнята. Складзена з магутных тоўшчаў вапнякоў, кварцавых пяскоў, гліністы сланцаў, граўвакаў, з вулканічных і вывергнутых парод. Большая частка А.с.в. прымеркавана да Апалачаў, другая



апушчана пад прыбярэжныя раўніны і шэльф Атлантычнага ак., трэцяя выходзіць на паверхню ў гарах Уошыта на тэр. Арканзаса і Аклахомы і на невял. участках у Тэхасе (Маратон) і ў Мексіцы. З ПнУ на ПдЗ падзяляецца на 3 сегменты з рознай арагенічнай гісторыяй: Ньюфаўндленд-Квебекскі, Пенсільванска-Тэнесійскі і Уошыта-Маратонскі. У межах сегментаў вылучаны правінцыі: Апалачскае плато, правінцыя Далін і Хрыбтоў, правінцыя Блакітнага хрыбта, Підмант і інш. Амаль усе структурныя элементы А.с.в. паралельна выцягнуты па дузе, павернутай выпукласцю да цэнтра мацерыка.

*Г.У.Зінавенка.*

**АПАЛА́ЧСКІ ВУ́ГАЛЬНЫ БАСЕ́ЙН**, на У ЗША, уздоўж паўд. схілаў Апалачаў, у Перадапалачскім перадавым прагіне; адзін з буйнейшых у свеце. Працягласць больш за 1200 км. Пл. каля 180 тыс. км². Вугляносныя адклады пермі і карбону. Агульныя запасы да глыб. 900 м — 1600 млрд. т. Каля 300 вугледабыўных раёнаў.

Прамысл. распрацоўка з 1800. Вугалі ў асноўным бітумінозныя. Цеплыня згарання 28,9—35,4 МДж/кг. Здабыча адкрытым і падземным спосабамі. Каля 65% вугалю выкарыстоўваецца эл. станцыямі, значная ч. каксавальнага вугалю экспартуецца ў Канаду, Японію, Зах. Еўропу.

**АПАЛА́ЧЫ** (Appalachian Mountains), горы на У Паўн. Амерыкі, у ЗША і Канадзе. Працягнуліся з ПдЗ на ПнУ на 2600 км; асн. хрыбты: Блу-Рыдж, Уайт-Маўнтынс, масіў Адырондак, Грын-Маўнтынс. Сярэдневышынныя. Пераважаюць выш. 1300—1600 м, найб. 2037 м, г. Мітчэл (Блу-Рыдж). Падзяляюцца А. на Паўночныя і Паўднёвыя (мяжа па рэках Мохак і Гудзон). Паўночныя А. — хвалістае пласкагор'е выш. 400—600 м, над якім узвышаюцца асобныя масівы і хрыбты, вяршыні згладжаны, ператвораны ледавіком у трогі. Паўднёвыя А. складаюцца з восевай зоны хр. Блу-Рыдж, з У да якога прымыкае плато *Підмант*, з З — *Апалачскае плато*. Утварыліся А. ў перыяд каледонскай складкавасці і герцынскага арагенезу, амаладжаны неатэктанічнымі падняццямі. Паўночная і паўд.-ўсх. ч. А. складзена з крышт. парод, зах. і паўд.-зах. — пераважна з асадкавых (пясчанікі, даламіты, вапнякі). Карысныя выкапні: каменны вугаль (гл. *Апалачскі вугальны басейн*), нафта, прыродны газ, жал. руда, тытан, азбест. Клімат на Пн умераны, на Пд субтрапічны, фарміруецца пад уплывам Атлантычнага ак. і асабліва Мексіканскага заліва. Сярэднія т-ры студз. вагаюцца ад -12 на Пн да 8 °С на Пд, ліп. адпаведна ад 18 да 26 °С. Ападкаў 1000—1300 мм за год. Рэкі цякуць у глыбокіх далінах, найбольшыя — Канектыкут, Гудзон, Саскуэхана і Тэнесі. Расліннасць паўн. ч. — хвойныя і мяшаныя лясы (елка, піхта, туя, гемлока, клён, вяз, гікоры), на Пд ад 41° паўд. ш. ў ніжнім поясе горныя шыракалістыя лясы (каштан, дуб, клён і эндэмікі — цюльпаннае дрэва, платан, магноліі), вышэй за 1000 м — мяшаныя і хвойныя лясы, затым субальпійскія лугі. Жывёльны свет — пераважна эндэмікі: віргінскі алень і віргінскі апосум, дрэвавы дзікабраз, мядзведзь барыбал, рысь, янот, скунс, выдра. А. — раён турызму, лыжнага і воднага спорту, паляванне. У А. нац. паркі Грэйт-Смокі-Маўнтынс (Тэнесі), Шэнандоа (Віргінія), Апалачская дарога ўздоўж хрыбта Блу-Рыдж. *М.В.Лаўрыновіч.*

**АПАЛЕСЦЭ́НЦЫЯ**, 1) рассеянне святла калоіднай сістэмай. Інтэнсіўнасць рассеяння залежыць ад суадносін паміж памерамі часцінак і даўжынёй светлавой хвалі. А. назіраецца ў выглядзе конуса, які свеціцца на цёмным фоне, пры праходжанні святла праз калоідную сістэму, напр. табачны дым; крытычная А. — у аптычна аднародных асяроддзях ва ўмовах *фазавых пераходаў* (памутненне растворaў палімераў каля крытычных т-р змешвання). 2) У мінералогіі аптычны эфект, найб. выразны ў паўпразрыстай разнавіднасці мінералу *апал*. Выяўляецца як малочна-белае ці перламутравае святло, якое адлюстроўваецца ад апалу, месяцовага каменю і некаторых інш. мінералаў.

Апалачы. Хрыбет Блу-Рыдж.

**АПАЛІ́НА-БА́СІНА**, вёска ў Беларусі, у Вензавецкім с/с Дзятлаўскага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр калгаса. За 3 км на З ад Дзятлава, 168 км ад Гродна, 16 км ад чыг. ст. Наваельня. 240 ж., 82 двары (1995). Аддз. сувязі.

**АПАЛІ́НЫ** (Opalinatea), клас паразітычных прасцейшых жывёл атр. эўгленавых. Жывуць у кішэчніку земнаводных, радзей рыб і паўзуноў. Больш за 100 відаў. Найб. вядома А. ranarum.



Апаліна.

Даўж. да 1 мм. Цела лістападобнае, плоскае, несіметрычнае, укрытае тысячамі кароткіх жгуцікаў. Стрававальнай сістэмы няма, жывяцца ўсёй паверхняй цела. Ядзер ад 2 да некалькіх соцень. Размнажаюцца бясполым спосабам (дзяленнем) і палавым — парным зліццём аднаядравых мікра- і макрагамет з утварэннем цысты, што трапляе ў ваду і праглынаецца апалонікамі. З цысты выходзіць маленькая А., якая вырастае ў шмат'ядзерную.

Г.Апалінэр.

**АПАЛІНЭ́Р** (Apollinaire) Гіём (сапр. Вільгельм Апалінарый Кастравіцкі; 26.8.1880, Рым — 9.11.1918), французскі паэт. Кастравіцкія паходзілі з Беларусі (з гэтага роду К.*Каганец*). Іх маёнтак Дарашковічы (каля Навагрудка) канфіскаваны пасля паўстання 1863—64. Дзед А. эмігрыраваў у Італію, там прайшло дзяцінства і юнацтва паэта. З 1899 А. у Парыжы. Удзельнік 1-й сусв. вайны. Літ. дзейнасць пачаў у 1901. У многіх творах адчуваецца духоўная сувязь з Расіяй, Польшчай, інш. слав. краінамі (верш «Адказ запарожскіх казакоў канстанцінопальскаму султану», раман «Жанчына ў крэсле», апавяданне «Сустрэча ў Празе»). Большасць твораў апублікавана пасмяротна. Пры жыцці выйшлі цыкл афарыстычных чатырохрадкоўяў «Бестыярый, ці Картэж Арфея» (1911), зб-кі «Алкаголь. Вершы 1898—1913» (1913), «Каліграмы. Вершы Вайны і Міру» (1918). Творчасць А. не пазбаўлена фармаліст. эксперыментаў (паасобныя вершы; буфонная п'еса «Грудзі Тырэзія», 1918; раман «Жанчына», 1920), падхопленых дадаістамі і сюррэалістамі. На бел. мову творы А. перакладала Э.Агняцвет (зб. «Зямны акіян», 1973).

*Тв.:* Рус. пер. — Избранная лирика. М., 1985.

**АПАЛО́Г** (грэч. apologos літар. апавяданне), у старажытнагрэчаскай і ўсх. л-ры кароткі павучальны апавядальны твор, пабудаваны на алегарычным паказе жывёл і раслін. Блізкі да *байкі*, але вобразы ў А. менш канкрэтныя, большае месца займае дыдактычны элемент. Найб. вядомы збор А. — у стараж.-інд. кнізе на санскрыце «Панчатантра» (3—4 ст.; у араб. і перс. перапрацоўках «Каліла і Дзімна», каля 750). А. ўключаліся

ў рэліг. і дыдактычныя аповесці («Гісторыя пра Варлаама і Іасафа»). Традыцыі гэтага жанру выкарыстаў Я.Колас у паэме «Сымон-музыка».

**АПАЛО́Н**, Ф е б , у грэчаскай міфалогіі бог сонца, святла, мудрасці, апякун мастацтваў. Сын *Зеўса* і *Леты*, брат-блізня *Артэміды*. У выяўл. мастацтве А. паказваўся прыгожым юнаком з лукам і стрэламі ці з кіфарай у руках. Валодаў дарам прадбачання і надзяляў ім людзей. У гонар перамогі А. над драконам-пачварай *Піфонам* каля Дэльфаў пабудаваны Дэльфійскі храм, дзе адбываліся святкаванні ў гонар А. (Піфійскія гульні). Былі шматлікія свяцілішчы А., найб. вядомыя ў Дэльфах і на в-ве Дэлас. Міф аб А. натхняў ант. скульптараў, жывапісцаў А.Мантэнья, Рафаэля,



Да арт. **Апалон**. Апалон Бельведэрскі. Скульпт. Леахар. 350—330 да н.э. Рымская копія.

Джарджоне, кампазітараў І.С.Баха, В.А.Моцарта, І.Стравінскага і інш.

**АПАЛО́Н**, малая планета. Дыяметр каля 1 км. Абарачаецца вакол Сонца па эліптычнай арбіце з перыядам 1,81 г. Адлегласць ад Сонца ў перыгеліі 0,645, у афеліі 2,327 а.а. Найменшая адлегласць ад Зямлі 15 млн. км. Адкрыта К.Рэйнмутам (Германія, 1932).

**«АПАЛО́Н»**, амерыканская праграма падрыхтоўкі і ажыццяўлення пілатуемых палётаў на Месяц, а таксама серыя касм. караблёў для яе выканання. Асн. прызначэнне — дастаўка касманаўтаў на Месяц; здзейснены таксама беспілотныя палёты і палёты касманаўтаў вакол Зямлі. У 1968—75 запушчана 15 «А.» з экіпажамі, усяго 38 касманаўтаў. На «А.-11» здзейснена першая ў свеце пасадка на Месяц (Н.*Армстранг*, Э.*Олдрын*, 1969). Па праграме «А.» даследавалі Месяц і калямесяцавую прастору, на Зямлю дастаўлены ўзоры месяцавага грунту.

Карабель «А.» мае асн. блок (для дастаўкі 3 касманаўтаў на селенацэнтрычную арбіту і вяртання іх на Зямлю) і месяцавую кабіну (для дастаўкі 2 касманаўтаў на паверхню Месяца, забеспячэння іх знаходжання на ім і вяртання на селенацэнтрычную арбіту). Маса «А.» да 47 т. Асн. блок уключае адсек экіпажа (спускальны апарат для пасадкі на воду і на сушу) і рухальны адсек. Месяцавая кабіна

Касмічны карабель «Апалон»: 1 — рухавіковы адсек; 2 — адсек экіпажа; 3 — пасадачная ступень месяцавай кабіны; 4 — узлётная ступень месяцавай кабіны.

мае пасадачную (застаецца на Месяцы) і ўзлётную ступені. «А.» забяспечаны стыкавачным прыстасаваннем для пераходу касманаўтаў з адсека экіпажа ў месяцавую кабіну. Запуск і вывядзенне «А.» на арбіту ШСЗ ажыццяўляліся ракетамі-носьбітамі тыпу «Сатурн». Мадыфікацыі «А.» выкарыстоўваліся для дастаўкі экіпажаў на арбітальную станцыю «*Скайлэб*» і стыкоўкі з караблём «Саюз-19» па праграме *ЭПАС*.

**АПАЛО́НІЙ** (Apollōnios) з А ф і н , старажытнагрэчаскі скульптар 1 ст. да н.э.

**Апалоны:**
1 — апалон;
2 — чорны.

Паслядоўнік *Лісіпа*. Прадстаўнік натуралістычнага кірунку ў эліністычным мастацтве. Аўтар скульптур «Бельведэрскі торс» і «Кулачны баец».

**АПАЛО́НІКІ**, лічынкі бясхвостых земнаводных. Развіваюцца з яйца. Жывуць у вадзе. У адрозненне ад дарослых асобін маюць прыкметы, уласцівыя рыбам (2—3 пары шчэлепаў, двухкамернае сэрца, доўгі хвост для перамяшчэння, органы прымацавання і бакавую лінію). Корм пераважна расліннy. Пасля 3—4 месяцаў развіцця гэтыя прыкметы знікаюць пры *метамарфозе*: сэрца робіцца трохкамерным, дыханне лёгачным, хвост знікае, вырастаюць заднія ногі і на сушу выходзіць маладое земнаводнае (напр., жабяня). Пажыва для рыб, птушак.

**«АПАЛО́Н» — «САЮ́З»**, эксперыментальны касм. палёт «Апалон» — «Саюз», гл. *ЭПАС*.

**АПАЛО́НЫ** (Parnassius), род дзённых матылёў сям. парусніка, або кавалераў, атр. лускакрылых. Сустракаюцца пераважна ў горных раёнах Еўразіі, лакальна на раўнінах. На Беларусі трапляюцца А. чорны (P. mnemosyne) і А. (P. apollo) — рэдкія віды, занесеныя ў Чырв. кнігу.

Размах белых крылаў да 9 см, пярэднія крылы з 2—5 чорнымі плямкамі, заднія з чырвонымі. А. чорны па памерах меншы і без чырвоных плямак на крылах. Лёт у чэрв.—жніўні. Вусені чорныя з 2 радамі чырвоных плямак, кормяцца ў крас.—маі лісцем чубаткі, скочак і заечай капусты. Жывуць групамі. Кукалкі на глебе. Зімуюць у абалонцы яйца.

**АПА́ЛУБКА**, часовая форма для ўкладкі бетоннай сумесі і арматуры пры вырабе бетонных і жалезабетонных *маналітных канструкцый*. Робіцца з дрэва, металу, фанеры, жалезабетону, пластмасаў і інш. матэрыялаў. Бывае разборна-перастаўная, аб'ёмна-блочная, слізгальнарухомая і інш. Выбар тыпу А. вызначаецца характарам канструкцый (збудаванняў), геам. памерамі, тэхналогіяй выканання работ, кліматычнымі ўмовамі.

Найб. пашырана разборна-перастаўная А. — дробнашчытавая (са шчытоў масай да 70 кг), буйнашчытавая (да 500 кг) і блочная (са шчытоў, злучаных у прасторавыя блокі, часам з рабочай арматурай). Выкарыстоўваецца пры заліўцы фундаментаў, сцен, вырабе пакрыццяў і перакрыццяў, калон, бэлек і інш. Пры адмоўнай т-ры шчыты ўцягляюць ці падагараюць. А б ' ё м н а - б л о ч н а я А. — прасторавая канструкцыя са стальных шчытоў, каркаса, мацаванняў і прыстасаванняў для адрыву шчытоў ад бетону. Мантаж і дэмантаж блок-формаў вядуць падымальнымі механізмамі. Выкарыстоўваецца для бетанавання канструкцый, якія стаяць асобна. С л і з г а л ь н а - р у х о м а я А. ствараецца пры буд-ве высокіх аб'ектаў (элеватараў, рэзервуараў, вежаў і інш.). Робіцца са шчытоў, якія падымаюцца з дапамогай дамкратаў па паверхні збудаванняў, што бетануюцца. Ёсць таксама п а д ' ё м н а - п е р а с т а ў н а я А. — са шчытоў, крапежных і пад'ёмных прыстасаванняў (для буд-ва вежаў, градзірняў і інш. высокіх збудаванняў); г а р ы з а н т а л ь н а п е р а с о ў н а я — са шчытоў і

каркаса на цялежках ці палазах (для ўзвядзення скляпенняў-абалонак, калектараў, падпорных сценак і інш.); **нязбымная** — пліты, абалонкі, метал. сеткі і інш., якія пасля бетанавання канструкцыі (напр., плаціны) застаюцца ў ёй як састаўная частка; **горная А.** — перасоўная, створкавая, секцыйная і інш., выкарыстоўваецца для мацавання горных выпрацовак; **стацыянарная металічная А.** — пры вырабе жалезабетонных канструкцый на з-дзе ці палігоне. Найб. эфектыўная А. шматразовага выкарыстання (інвентарная), збіраецца з уніфікаваных элементаў і ўзбуйненых блокаў. Каб паверхня канструкцыі была гладкая, А. змазваюць ці пакрываюць пастай. Работы, звязаныя з вырабам, устаноўкай і разборкай А., наз. апалубнымі работамі.

**АПАЛУ́ШКІ**, паланкі, невялікія начоўкі для ачысткі (правейвання) зерня ў хатніх умовах на Беларусі.

**АПАЛЧЭ́ННЕ**, 1) часовае ваеннае фарміраванне (пераважна добраахвотнае) з цывільнага насельніцтва для адпору ворагу ў надзвычайных умовах. Вядома са старажытнасці. Пры феадалізме універсальная сістэма агульнай мабілізацыі доўгі час масавае народнае А. было асн. спосабам разгортвання войска, ядро якога складала княжацкая (каралеўская, ханская) дружына. А. наз. таксама сярэдневяковыя ваен. фарміраванні міліцыйнага тыпу (рыцарскае, дваранскае, гарадское А.). У Расіі вядомы масавыя А. ў 1611—12, 1812, 1855—56. Вял. ролю адыграла *Народнае апалчэнне* ў Вял. Айч. вайне 1941—45.

На тэр. Беларусі А. наз. *пагоняй*. У 13—14 ст. адыгрывала важнейшую ролю ў абароне краіны. У сталым сярэднявеччы масавую мабілізацыю сялян замяніла феад. А. (ахоплівала ўсіх землеўладальнікаў). Велічыня зямельнага надзелу вызначала памер вайсковай павіннасці (земскай службы). Ухвалу (пастанову) аб скліканні ўсеагульнага А. мог прыняць толькі *вальны сойм*. Войскі А. мелі ўласную вял. харугву. Кіраваў А. найвышэйшы, з 17 ст. вял. гетман літоўскі. Нярэдка камандаванне прымаў кароль і вял. князь ВКЛ. А. з тэр. ўсёй дзяржавы склікалася ў 1528, 1567, 1654 і інш. гады. З 17 ст. эфектыўнасць такой формы арганізацыі войска знізілася, але інстытут А. існаваў да канца 18 ст.

2) Дзярж. А. — частка ўзбр. сіл Расійскай імперыі ў 1874—1917 (прызначалася для папаўнення дзеючай арміі і дапаможнай службы ў ваен. час). Аналагічная катэгорыя ваеннаабавязаных у Венгрыі наз. гонвед, у Аўстра-Венгрыі і Германіі — *ландвер* і *ландштурм*.

**АПАМІ́КСІС** (ад *апа...* + грэч. mixis змяшэнне), спосаб бясполага размнажэння раслін і жывёл; утварэнне зародка без апладнення. Бывае пастаянны, спадчынны, або выпадковы, няспадчынны. Яго можна выклікаць эксперыментальна — фіз.-хім. ўздзеяннямі (індуцыраваны А.). Пры А. зародак можа ўтварацца з неаплодненай яйцаклеткі (*партэнагенез*), з клетак зарастка або зародкавага мяшка (*апагамія*), з клетак спарафіта (*апаспарыя*), з саматычных клетак семязавязі — нуцэлуса, інтэгументаў (адвентыўная эмбрыянія). А. ў форме партэнагенезу вядомы ў чарвей, насякомых, рыб, паўзуноў. Розныя формы А. выяўлены амаль ва ўсіх групах расліннага свету. Выкарыстоўваюць у селекцыі, напр. для спадчыннага замацавання гетэрозісу.

**Апалубка:** *а* — разборна-перастаўная; *б* — гарызантальна перасоўная (1 — шчыт; 2 — падтрымнае прыстасаванне; 3 — цялежка; 4 — каток).

Слізгальная **апалубка** (фрагмент): 1 — дамкратны стрыжань; 2 — гідраўлічны дамкрат; 3 — дамкратная рама; 4 — рабочы насціл; 5 — каркас рабочага насцілу; 6 — шчыт апалубкі; 7 — унутраныя падвесныя рыштаванні; 8 — вонкавыя падвесныя рыштаванні; 9 — казырок па вонкавым перыметры апалубкі.

**АПАНАСЕ́ВІЧ** Павел Андрэевіч (н. 14.7.1929, в. Старасселле Докшыцкага р-на Віцебскай вобл.), бел. фізік. Акад. (1984, чл.-кар. 1980) АН Беларусі. Засл. дз. нав. Беларусі (1955). Д-р фіз.-матэм. н. (1974), праф. (1977). Скончыў БДУ (1954). З 1955 у Ін-це фізікі АН Беларусі (з 1987 дырэктар). Навук. працы па оптыцы і лазернай фізіцы. Развіў тэорыю ўздзеяння магутнага выпрамянення на спектральна-аптычныя характарыстыкі атамаў і малекул, устанавіў шэраг заканамернасцяў узаемадзеяння па-

П.А.Апанасевіч.

токаў святла ў розных асяроддзях, генерацыі звышкароткіх светлавых імпульсаў, вымушанага камбінацыйнага рассеяння. Распрацаваў шэраг метадаў нелінейнай спектраскапіі і кіравання параметрамі лазерных патокаў. Дзярж. прэмія Беларусі 1978. Дзярж. прэмія СССР 1982.

*Тв.*: Таблицы распределения энергии и фотонов в спектре равновесного излучения. Мн., 1961 (разам з В.С.Айзенштатам); Основы теории взаимодействия света с веществами. Мн., 1977.

**АПАНА́СЕНКА** Аляксандр Рыгоравіч (н. 23.11.1911, Кіеў), украінскі і бел. балетмайстар. Засл. арт. Украіны (1951), засл. дз. маст. Беларусі (1961). Вучыўся ў балетных студыях у Кіеве. У 1928—59 і з 1971 працаваў на Украіне (саліст балета, балетмайстар). У 1959—71 маст. кіраўнік і гал. балетмайстар *Дзяржаўнага ансамбля танца Рэспублікі Беларусь*. На аснове перапрацоўкі нац. харэаграфічных традыцый стварыў сцэнічныя варыянты бел. танцаў «Лянок», «Бычкі», «Лявоніха», «Мяцеліца». Найб. значныя пастаноўкі: аднаактовы харэаграфічны спектакль «Беларуская партызанская», «Беларуская сюіта», «Беларуская рапсодыя», «Маладзёжная сюіта» і інш.

*Літ.*: Чурко Ю.М. Белорусский сценический танец. Мн., 1969. С. 86—94.

**АПАНА́СЕНКА** Марыя Акімаўна (н. 16.3.1926, г. Днепрапятроўск), бел. танцоўшчыца. Засл. арт. Беларусі (1964). З 1945 працавала ў розных маст. калектывах Украіны, у 1959—68 салістка Дзярж. ансамбля танца БССР. Выконвала адказныя сола ў пастаноўках калектыву «Беларуская рапсодыя», «Беларуская сюіта», «Лявоніха», «Мяцеліца», «Чардаш» і інш.

**АПАНЕ́НТ** [ад лац. opponens (opponentis) які пярэчыць], 1) праціўнік у спрэчцы, дыскусіі. 2) Асоба, якой даручана публічная ацэнка дысертацыі, даклада, напр. афіц. А.

**АПАНЕ́ЎРО́З** (ад *апа...* + *неўроз*), злучальнатканкавая пласціна са шчыльных, б.ч. размешчаных паралельна калагенавых і эластычных валокнаў, з дапамогай якой фіксуюцца мышцы. Прымацоўвае шырокія мышцы да касцей або да інш. тканак цела і абмяжоўвае іх. Напр., далонны А. абмяжоўвае рухомасць згінальнікаў пальцаў, А. вонкавай косай мышцы жывата — рухомасць сценкі брушной поласці і інш.

**АПА́НСКІ** Іосіф Казіміравіч (парт. псеўд. Краўчынскі, Міхайлаў; 18.7.1897, в. Сталярышкі Анікшчайскага р-на, Літва — 7.6.1927), савецкі дзярж. дзеяч. У 1919 чл. ЦВК Літ.-Бел. ССР, Віленскага гаркома КП(б)ЛіБ, рэўтрыбунала, старшыня Мазырскага пав. рэўкома. З 1920 нам. нач. асобага аддзела 16-й арміі. З 1922 у ЧК Петраградскай ваен. акругі і Самары. У 1923 нач. Вышэйшай паграншколы ў Маскве, ст. пам. гал. інспектара войскаў Аб'яднанага дзярж. паліт. ўпраўлення (АДПУ). З 1924 нам. паўнамоцнага прадстаўніка АДПУ па Бел. ваен. акрузе і адначасова з 1926 нач. Бел. аддзялення Гал. таможнага ўпраўлення СССР. Удзельнічаў у ліквідацыі эсэраўскага падполля на Беларусі, у стварэнні сістэмы паліт. нагляду, падрыхтоўцы абвінавачванняў у «нацдэмаўшчыне» прадстаўнікоў бел. інтэлігенцыі. Канд. у чл. ЦК КП(б)Б і чл. ЦВК БССР у 1925—27. Загінуў пры выкананні службовых абавязкаў.

**АПАПЛЕКСІ́Я** (ад грэч. apoplēssō разбіваць ударам), крывазліццё, што хутка развіваецца, у які-небудзь орган, напр. мозг (гл. *Інсульт*).

**АПАРА́Т** (ад лац. apparatus абсталяванне), 1) прылада, тэхн. ўстройства, прыстасаванне. 2) Сукупнасць дзярж. установ, арг-цый, якія абслугоўваюць якую-н. галіну кіраўніцтва, гаспадаркі і інш. 3) Наменклатурныя супрацоўнікі вышэйшых органаў кіравання. 4) Заўвагі, паказальнікі і інш. дапаможны матэрыял да навук. працы, выдання. 5) Сукупнасць органаў чалавека, жывёл або раслін, якія выконваюць якую-н. функцыю ў арганізме, напр. стравальны А., дыхальны А.

**АПАРО́ВІЧ** Андрэй Фёдаравіч (н. 28.2.1922, в. Пліса Смалявіцкага р-на Мінскай вобл.), бел. вучоны ў галіне радыёэлектронікі. Д-р тэхн. н. (1965), праф. (1966). Скончыў Ленінградскую ваенна-паветраную інж. акадэмію (1952). Працаваў у Харкаўскім вышэйшым ваен. вучылішчы (1956—1973), з 1975 — у Бел. ун-це інфарматыкі і радыёэлектронікі. Навук. працы па статыстычнай тэорыі эл.-магн. сумяшчальнасці радыёсродкаў і канструяванні прылад для кантролю выбіральных уласцівасцяў радыёпрыёмнікаў.

*Тв.*: Статистическая теория электромагнитной совместимости радиоэлектронных средств. Мн., 1984; Проектирование радиотехнических систем. Мн., 1988.

**АПАРТАМЕ́НТЫ** (ад франц. appartement кватэра), група жылых і дапаможных пакояў, вылучаных у адзін комплекс для пражывання пэўнай асобы; уключалі прыхожую, спальню, гардэроб, кабінет або *будуар*, парадную залу і інш. Пашыраны з 16 ст. ў палацах Італіі і Францыі. На Беларусі А. былі ў магнацкіх рэзідэнцыях 17—18 ст. У 19 — пач. 20 ст. А. ствараліся ў дамах секцыйнага і блакіраванага тыпаў. У наш час А. называюць і вял. багатае памяшканне.

**АПАРТУНІ́ЗМ** (франц. opportunisme ад лац. opportunus зручны), 1) адносіны асобы з грамадствам і дзяржавай, характэрнымі асаблівасцямі якіх з'яўляюцца прыстасаванне і згода. У сав. гіст. навуцы тэрмінам «А.» пазначалася ідэалогія «прыстасавальніцтва, згодніцтва», якая адлюстроўвала вузкакласавы дагматычны стыль мыслення. 2) У паліт. жыцці, рабочым і прафс. руху палітыка вырашэння праблем не праз антаганізмы, напружанасць і рэвалюцыю, а метадамі плаўнага пераходу грамадства з аднаго стану ў іншы. Такую канцэпцыю (заснавальнікі Э.Бернштэйн, К.Каўцкі, Л.Мартаў) крытыкавалі У.І.Ленін і наступныя пакаленні камуністаў. У 1950—80-я г. ўнутры камуніст. руху развіта ў працах М.Джыласа, М.Нара, О.Шыка, Р.Гародзі, С.Карыльё. Гэтай канцэпцыі ў пэўнай ступені прытрымлівалася частка кіраўніцтва б. СССР на чале з М.С.Гарбачовым. Яе прыхільнікамі ў краінах Зах. Еўропы з'яўляюцца с.-д. і сацыяліст. партыі, якія ўваходзяць у *Сацыялістычны Інтэрнацыянал*. Гіст. практыка развіцця краін пацвердзіла жыццяздольнасць палітыкі А. і яе ролю ў трансфармацыі грамадска-эканам. адносін.

*А.А.Чалядзінскі.*

**АПАРТЭ́ІД**, апартхейд (на мове афрыкаанс apartheid раздзельнае пражыванне), грамадска-палітычная дактрына, якая абгрунтоўвала і заканадаўча замацоўвала палітыку расавай дыскрымінацыі і сегрэгацыі, што праводзілася расісцкімі ўладамі Паўднёва-Афрыканскай рэспублікі (ПАР) у дачыненні да карэннага афр. насельніцтва і інш. этнічных груп нееўрапейскага ці мяшанага паходжання. Як афіц. дзярж. палітыка абвешчана ў 1948 урадам кіруючай Нацыяналіст. партыі. Абазначаў пазбаўленне чорнай і «каляровай» большасці насельніцтва ПАР паліт., сац.-эканам. і грамадзянскіх правоў, яе тэр. адасабленне і ізаляцыю (гл. *Бантустаны*). Як адна з крайніх формаў *расізму* А. у 1966 у шэрагу дакументаў ААН асуджаны і абвешчаны злачынствам супраць чалавецтва. У 1973 ААН прыняла Міжнар. канвенцыю аб спыненні А. і пакаранні за яго (уступіла ў дзеянне ў 1976). Барацьба карэннага насельніцтва і міжнар. супольніцтва супраць А. прымусіла ўлады ПАР з 1976 мадыфікаваць палітыку А., адмовіцца ад шэрагу яго асноватворных палажэнняў, расавай дыскрымінацыі і сегрэгацыі. Астатнія палажэнні А. ліквідаваны на пач. 1990-х г. урадам Ф. дэ Клерка.




Апарэль.

**АПА́РЫН** Аляксандр Іванавіч (2.3.1894, г. Угліч, Расія — 21.4.1980), савецкі вучоны-біяхімік, грамадскі дзеяч. Акад. АН СССР (1946, чл.-кар. 1939), ганаровы чл. акадэмій навук Балгарыі, ГДР, Кубы, Іспаніі, Італіі. Герой Сац. Працы (1969). Скончыў Маскоўскі ун-т (1917). З 1929 праф. гэтага ун-та. У 1935 з А.М.Бахам арганізаваў Ін-т біяхіміі АН СССР, з 1946 яго дырэктар. Навук. працы па біяхіміі раслін, праблеме ўзнікнення жыцця на Зямлі. Заснавальнік эвалюцыйнай біяхіміі, вучэння пра хім. эвалюцыю дабіялагічнага перыяду развіцця жыцця. Ленінская прэмія 1974. Залатыя медалі імя І.І.Мечнікава (1960) і М.В.Ламаносава (1979).

*Тв.*: Возникновение жизни на Земле. 3 изд. М., 1957; Жизнь, ее природа, происхождение и развитие. 2 изд. М., 1968.

**АПАРЫ́Я** (грэч. aporia літар. бязвыхаднасць), тэрмін, які абазначае цяжкавырашальную праблему, звычайна звязаную з супярэчнасцю паміж данымі вопыту і мысленным аналізам. Упершыню А. выкарыстаны ў стараж.-грэч. філасофіі. Найб. вядомыя апарыі Зянона з Элеі (выяўлялі супярэчнасці ў паняццях неперарыўнасці руху, часу і прасторы), *Сакрата, Платона, Арыстоцеля* і *скептыкаў*.

**АПАРЭ́ЛЬ** (ад франц. appareil уезд), 1) пакаты спуск у акопах і ўкрыццях для ўезду (выезду) ваен. тэхнікі. У крэпасцях А. рабілі для ўсцягвання гармат на ўзвышшы. 2) Пакаты насып (часам рухомая платформа) для пагрузкі тэхнікі (жывёлы) на чыг. транспарт або пераправачныя сродкі. 3) Прыстасаванне ў насавой частцы карабля для сходу асабовага складу і ваен. тэхнікі на бераг. 4) Нахіленая пліта для ўезду (праезду) да ўзвышаных будынкаў і інш. (гл. таксама *Пандус*).

**АПАСПАРЫ́Я** (ад *апа...* + *спора*), развіццё *гаметафіта* ў некаторых вышэйшых раслін з вегетатыўнай клеткі *спарафіта* без утварэння спораў (гаплоіднай фазы развіцця). Напр., зарастка папараці з тканкі або ножкі спарангія; развіццё зародкавага мяшка ў пакрытанасенных з клетак семязавязі

(*нуцэлуса* і інш.) без рэдукцыйнага дзялення (меёзу). Звычайна спалучаецца з рознымі формамі *апаміксісу* або з палавым працэсам.

**АПАСРО́ДКАВАННЕ**, вызначэнне рэчы (паняцця) праз яе адносіны да інш. рэчы (паняцця); адна з асн. катэгорый у філасофіі Гегеля. Уласцівасці рэчаў раскрываюцца ў іх узаемадзеяннях з інш. рэчамі; толькі праз гэтыя рэальныя ўзаемадзеянні рэч можа быць вызначана як дадзеная канкрэтная рэч. Катэгорыя А. ў адзінстве з катэгорыяй непасрэднага адлюстроўвае факт усеагульнай узаемасувязі з'яў, універсальнасці развіцця розных рэчаў і паняццяў, што іх адлюстроўваюць.

**АПАСТА́ЗІЯ**, гл. *Адступніцтва*.

**АПАСТО́ЛІКІ**, апостальскія браты, сялянска-плебейская ерэтычная секта 13 — пач. 15 ст. ў Паўн. Італіі. Засн. ў 1260 у г. Парма рамеснікам *Сегарэлі*. Прапаведавалі вяртанне да сац. і маёмаснай роўнасці паводле вучэння раннехрысц. апосталаў (адсюль назва), выступалі супраць феад. дзяржавы і каталіцкай царквы. Секта асуджана як ерэтычная і забаронена II Усяленскім саборам (Ліён, 1274), Сегарэлі ў 1300 спалены. Яго пераемнік *Дальчына* ў 1304 узняў паўстанне, якое задушана ў 1307. А. прапаведавалі свае ідэі ў Паўн. Італіі, Паўд. Францыі, Іспаніі і Германіі да 15 ст.

**АПАСТЭРЫЁРЫ І АПРЫЁРЫ** (лац. a posteriori літар. з наступнага, a priori літар. з папярэдняга), апастэрыёры — веды, атрыманыя з вопыту, апрыёры — веды, якія папярэднічаюць вопыту і атрыманы да і незалежна ад яго, першапачаткова ўласцівыя свядомасці. Супрацьпастаўленне А. і а. найбольш адлюстравана ў *рацыяналізме* новага часу (Дэкарт, Лейбніц), паводле якога існуюць усеагульныя і неабходныя ісціны, якія ў аснове адрозніваюцца ад выпадковых ісцін, набытых апастэрыёрным (вопытным) спосабам. Такое супрацьпастаўленне характэрна і для філасофіі Канта, які прызнаваў наяўнасць усеагульных і неабходных ісцін, лічыў крыніцай іх безумоўнасці (ападыктычнасці) апрыёрнасць. Кант прызнаваў апрыёрнымі толькі спосаб арганізацыі ведаў, іх форму, якая напаўняецца апастэрыёрным зместам, робіць магчымым існаванне ўсеагульных і неабходных тэарэт. сцвярджэнняў.

*Літ.*: Кант И. Соч. Т. 3. М., 1964; Швырев В.С. Теоретическое и эмпирическое в научном познании. М., 1978.

*В.П.Оргіш.*

**АПАТРАПЕ́Й** (ад грэч. apotropaios які адводзіць бяду), амулет, абярэг, прадмет, выява або дзеянне, якім прыпісвалі магічную здольнасць засцерагаць ад няшчасця і злога духу.

А. былі выявы жахлівых божастваў, звяроў і прадметаў (егіпецкага Беза, Гарпагоны, льва, грыфона, фаласа, складзеных пальцаў і г.д.), якія насілі як нацельныя амулеты; архітэктурныя рэльефы ў выглядзе звярыных мордаў і падобныя выявы на пасудзінах, зброі; нацельныя крыжыкі і ладанкі, што быццам аберагаюць вернікаў ад «нячыстай сілы».

Бел. нар. назва абярэг. З эпохі палеаліту як А. выкарыстоўвалі *амулеты* з зубоў, кіпцюроў і касцей жывёл. Розныя амулеты-А. былі ў эпоху язычніцтва і ранняга хрысціянства: у курганных могільніках 9—13 ст. на Беларусі знойдзены амулеты-падвескі (лунніцы, крыжыкі), амулеты-змеевікі, змеегаловыя бранзалеты і інш. Апатрапейная сімволіка прысутнічала ў традыц. сямейнай і каляндарнай абраднасці. На Палессі А. было «завівала», якім накрывалі маладую ў найб. адказныя моманты вяселля; да вянца незалежна ад пары года надзявалі верхняе суконнае або футравае адзенне. Апатрапейная заклінальная *магія* — неад'емная частка вясенне-летніх абрадаў: сцябанне людзей і жывёлы асвячонай вярбой з традыц. прыгаворамі, асвячэнне вуглоў новай хаты

Апатыт.

свянцонай вадою; магічны круг вакол двара ў час падрыхтоўкі да веснавой сяўбы; трохразовы абход жывёлы з магічнымі прадметамі і заклінаннямі перад першым выганам у поле; юраўская раса, *абрадавае печыва* ў выглядзе крыжа і інш. Апатрапейны кірунак мелі такія формы калектыўнай абраднасці, як абворванне вёскі, хрэсны ход, тканне ручніка за дзень ці ноч, здабыванне «жывога» агню трэннем і інш. Адным з дзейсных А. здаўна лічыўся чырвоны колер і арнамент. А. лічыліся хлеб, вада, агонь, раса, зямля, вострыя металічныя прадметы, чалавечыя валасы, бурштын, зерне, ільняное валакно і семя, мак, пахучыя расліны (цыбуля, часнок, мята, палын) і інш.

**АПАТРЫ́ДЫ** (ад грэч. apatris пазбаўлены бацькаўшчыны), асобы, якія не маюць грамадзянства ніводнай краіны. Іх прававое становішча ў асноўным рэгулюецца нац. законамі дзяржаў і міжнар. пагадненнямі (канвенцыі аб статусе А. 1954, аб скарачэнні безграмадзянства 1961 і інш.), якія прадугледжваюць устанаўленне для А. статуса іншаземцаў і льготных умоў для набыцця імі грамадзянства краіны, дзе яны жывуць.

**АПАТЫ́Т** (ад грэч. apatē падман), мінерал класа фасфатаў $Ca_5[PO_4]_3\cdot(F,Cl,OH)_2$. Колькасць фосфарнага ангідрыту $P_2O_5$ — 41—42,3%. Прымесі $CO_2$, $SO_3$, $SiO_2$, Mn, рэдказямельных элементаў, U, Sr і інш. Крышталізуецца ў гексаганальнай сінганіі, утвараючы падоўжана-прызматычныя, ігольчастыя, радзей таблітчастыя крышталі. Агрэгаты зярністыя, зямлістыя і інш. Колер белы, блакітны, жоўты, фіялетавы, чорны. Бляск шкляны, тлусты. Цв. 5. Шчыльн. ад 2,95 да 3,8 г/см$^3$. Паходжанне магматычнае, гідратэрмальнае, пнеўматалітавае. Сумесь А. з кальцытам, гіпсам і інш. у выглядзе зямлістых утварэнняў або канкрэцый наз. *фасфарытам*. Сыравіна для вытв-сці ўгнаенняў, фосфарнай кіслаты і яе соляў; выкарыстоўваецца ў металургіі, керамічнай і шкляной прам-сці. На Беларусі як акцэсорны мінерал трапляецца ва ўсіх адкладах. Сінтэтычны А. з прымессю рэдказямельных элементаў выкарыстоўваюць у оптыцы.

**АПАТЫ́ТАВЫЯ РУ́ДЫ**, прыродныя мінер. агрэгаты, у якіх ёсць апатыт у колькасцях і формах, што адпавядаюць умовам прамысл. перапрацоўкі. Па колькасці фосфарнага ангідрыту $P_2O_5$ А.р. падзяляюцца на багатыя (больш за 18%), бедныя (5—8%) і збедненыя (3—5%). Па ўмовах утварэння вылучаюць эндагенныя (у масівах шчолачных магматычных парод), экзагенныя (радовішчы выветрывання) і метамарфізаваныя (пераўтвораныя) радовішчы. Найбольшае прамысл. значэнне маюць магматычныя радовішчы, звязаныя з масівамі нефелінавых сіенітаў ($P_2O_5$ 16—19%). А.р. выкарыстоўваюцца для вытв-сці мінер. угнаенняў, фосфарнай кіслаты, розных соляў, у металургіі, керамічнай, шкляной і хім. прам-сці. Найбольшыя запасы А.р. у Рас. Федэрацыі, Бразіліі, ПАР, Фінляндыі, Уганде, Нарвегіі, Зімбабве, Канадзе, Іспаніі, Індыі.

**АПАТЫ́ТЫ**, горад у Расіі, у Мурманскай вобл., за 185 км на Пд ад Мурманска. Размешчаны на Кольскім п-ве паміж воз. Імандра і Хібінамі. Засн. ў 1935. 82,1 тыс. ж. (1994). Чыг. станцыя. Горназдабыўная прам-сць; вытв-сць буд. матэрыялаў. Кіраўская ДРЭС. Кольскі філіял Рас. АН.

**АПА́ТЫЯ** (ад грэч. apatheia абыякавасць), стан поўнай абыякавасці, пасіўнасці, страты (поўнай або частковай) інтарэсу да навакольнага, унутраных памкненняў, эмац. рэакцый. Можа быць адзнакай некаторых псіх. хвароб (напр., шызафрэніі) або парушэння дзейнасці залозаў унутр. сакрэцыі.

**АПАТЭ́ЦЫЙ** (ад грэч. apothēkion сховішча), адкрытае пладовае цела некаторых сумчатых грыбоў (*дыскаміцэтаў*) і дыскаміцэтных лішайнікаў. Звычайна

мае сподка-, чаша-, дыскападобную і інш. формы, зрэдку мае выгляд шапачкі на ножцы (напр., у смаржкоў). Верхні гіменіяльны слой (*гіменій*) афарбаваны ў розныя колеры і складаецца з *парафізаў*, сярод якіх знаходзяцца сумкі са спорамі. Гіменій звычайна падсцілае тонкі слой пераплеценых гіфаў (субгіменій, або гіпатэцый). У лішайнікаў у А. часта ўключаецца ганідыяльны слой водарасцяў. Асаблівасці будовы і колеру А. — важная сістэматычная прыкмета для вызначэння таксонаў у мікалогіі.

**АПАФЕГМА́ТЫ** (ад грэч. apophthegma кароткае выказванне, выслоўе), старажытныя зборнікі свецкай апавядальнай літаратуры, у якіх змяшчаліся выказванні ці павучальныя гісторыі з жыцця пісьменнікаў, філосафаў і інш. вядомых людзей. Узніклі ў Стараж. Грэцыі (Плутарх). У эпоху Адраджэння пашырыліся ў Зах. Еўропе (Ф.Петрарка, Дж.Бакачыо), трапілі ў Польшчу (М.Рэй), а праз яе і на ўсх.-слав. землі. Далейшае развіццё А. прывяло да ўзнікнення зборнікаў *фрашак*, баек, эпіграм. На Беларусі вядомы з канца 16 — пач. 17 ст. Іх выкарыстоўвалі ў палемічных творах А.Мужыловскі, І.Пацей, Хрыстафор Філалет. Найб. вядомыя і папулярныя былі «Апафегматы» (1599) Б.Буднага, пераклады якіх распаўсюджваліся ў рукапісах у Расіі і неаднаразова выдаваліся ў 18 ст. Кнігу дыдактычных двухрадкоўяў «Апафегматы» выдаў у 1854 І.Легатовіч. *У.Г.Кароткі.*

**АПАФЕ́МА** правільнага многавугольніка, адрэзак перпендыкуляра, апушчанага з цэнтра правільнага многавугольніка на любую з яго старон. А. правільнага n-вугольніка роўная радыусу $r_n$ упісанай у яго акружнасці і звязана з яго стараной $a_n$ і плошчай $S_n$ суадносінамі: $a_n=2r_n\operatorname{tg}\frac{\pi}{n}$, $S_n=nr_n^2\operatorname{tg}\frac{\pi}{n}$. А. правільнай піраміды — вышыня яе бакавой грані.

**АПАФЕО́З** (ад грэч. apotheōsis абагаўленне), 1) услаўленне, узвелічэнне падзеі, з'явы, асобы; урачыстае завяршэнне падзеі. У стараж. егіпцян, потым у грэкаў і рымлян — абагаўленне правіцеляў за іх асаблівыя заслугі. А., які з цягам часу трансфармаваўся ў культ правіцеляў, браў пачатак у стараж. блізкаўсх. традыцыі прылічэння цароў да багоў або сыноў божых. Матывамі ўслаўлення духоўнай велічы народа, чалавека, выдатных гіст. ці грамадскіх падзей прасякнуты многія творы сусветнай л-ры і мастацтва, у т.л. бел. пісьменнікаў, паэтаў і дзеячаў культуры. 2) Заключная ўрачыстая масавая сцэна святочнай канцэртнай праграмы, спектакля, поўная асаблівага ўздыму, велічы. Напр., усхвалявана, урачыста гучыць заключная сцэна драмы Я.Купалы «Раскіданае гняздо», калі героі, ахопленыя духоўным парывам і высакародным мэтай, ідуць на Вялікі сход, па Бацькаўшчыну. А. можа быць таксама самаст. часткай паказу свята, шэсця (звычайна без тэксту) з выкарыстаннем выразных вобразаў, сюжэтаў, дэкарацыйнага афармлення, касцюмаў, бутафорыі.

**АПАФЕРМЕ́НТ** (ад *апа...* + *фермент*), апаэнзім, бялковая частка складаных (двух- і шматкампанентных) *ферментаў*. Вызначае выбіральныя дзеянні ферменту ў адносінах да субстрату і магчымасць рэгулявання яго актыўнасці. Для выяўлення каталітычнай актыўнасці А. неабходная наяўнасць небялковага кампанента — кафактару (каферменту).

**АПАФІЛІ́Т** (ад *апа...* + грэч. phyllon ліст), пародаўтваральны мінерал падкласа слаістых сілікатаў $KCa_4[Si_4O_{10}]_2F\cdot 8H_2O$. Крышталізуецца ў тэтраганальнай сінганіі. Таблітчастыя, прызматычныя крышталі або зярністыя, ліставатыя і інш. агрэгаты, шчыльныя масы. Бясколерны, белы, бледна-жоўты, ружовы ці зялёны. Празрысты. Бляск шкляны да перламутравага. Цв. 4,5—5. Шчыльн. 2,3—2,4 г/см³. Гідратэрмальны мінерал. Трапляецца ў мандалінах і друзах у базальтах, пустотах і трэшчынах у гранітах, вапняках, скарнах і інш.

Апатэцый сумчатага грыба з дыскамі-цэтаў: 1 — гіфы; 2 — сумкі са спорамі.



Апафема: *а* — правільнага многавугольніка; *б* правільнай піраміды.

Апафіліт.

**АПАФІ́ТЫ** [ад *апа...* + *..фіт*(ы)], абарыгенныя расліны, якія з прыродных лясных, лугавых, балотных і інш. згуртаванняў перайшлі на тэрыторыі, звязаныя з гасп. дзейнасцю чалавека (палі, падвор'і, месцы здабычы карысных выкапняў і інш.). У новых месцах А. — *пустазелле*. На Беларусі да А. належаць блюшчык плюшчападобны, крапіва двухдомная, купкоўка зборная, снітка звычайная, чальчак вербалісты і інш.

**АПАХРАМА́Т** [ад *апа...* + грэч. chrōma (chrōmatos) колер], складаны *аб'ектыў* са значна зменшанай храматычнай *аберацыяй аптычнай сістэмы*. Складаецца са спец. падабраных лінзаў і люстэркаў. Выкарыстоўваецца ў каляровай фатаграфіі, кінематаграфіі, паліграфіі і тэлебачанні.

**АПА́ЧЫ**, дэне, племя паўночнаамерыканскіх індзейцаў. Разам з племем наваха складаюць паўд. групу *атапаскаў*. У мінулым А. — качавыя паляўнічыя. Жывуць у рэзервацыях штатаў Арызона, Новая Мексіка і Аклахома ў ЗША. Колькасць 21 тыс. чал. (без наваха, 1987). Паводле рэлігіі хрысціяне.

**АПВЕ́ЛІНГ** (ад англ. up наверх + well хлынуць), падыманне водаў з глыбіняў у верхнія слаі акіяна, мора. Выклікаецца ўстойлівымі вятрамі, што зганяюць паверхневыя воды ў адкрытае мора, на месца якіх падымаюцца воды слаёў, што ляжаць ніжэй, а таксама пасатнымі і ўсх. памежнымі цячэннямі ў Атлантычным, Ціхім і інш. акіянах. Асабліва актыўны ў прыбярэжных зонах, дзе вада падымаецца з глыбіняў 100—300 м. Агульная пл. пастаяннага А. складае 1 млн. км² пры сярэдняй вертыкальнай скорасці падняцця водаў 1 м/сут. З цыркуляцыяй акіянскіх водаў у працэсе А. звязваюць утварэнне некаторых радовішчаў карысных выкапняў (напр., фасфарытаў), размяшчэнне багатых прамысл. раёнаў акіяна.

**А́ПДАЙК** (Updike) Джон (н. 18.3.1932, Шылінгтан, штат Пенсільванія, ЗША), амерыканскі пісьменнік. Скончыў Гарвардскі ун-т (1954). На пачатку літ. дзейнасці пісаў фельетоны, апавяданні, вершы, эсэ, пародыі: зб-кі вершаў «Драўляная курыца і іншыя ручныя стварэнні» (1958), апавяданняў «Тыя ж дзверы» (1959), «Галубінае пер'е» (1962). Вядучая тэма творчасці — побыт, псіхалогія, маральныя каштоўнасці радавога амерыканца (аповесць «Ферма», 1965; раманы «Кірмаш у багадзельні», 1959; «Трус, ущякай», 1960; «Трус, які вылечыўся», 1979; «Трус разбагацеў», 1981, і інш.). У рамане А. «Кентаўр» (1963) праблема смерці і бессмяротнасці пераплятаецца з пошукамі сэнсу жыцця, пераадоленнем адчужэння, са сцвярджаннем дабрыні; у раманах «Месяц адпачынку» (1975), «Давай

пажэнімся» (1976), «Іствікскія ведзьмы» (1984) і інш. імкненне перамагчы боязь смерці любоўю, сексуальным «адраджэннем»; раман-дыспут «Версія Роджарса» (1985) пра «навук. доказы быцця божага». Аўтар зб. апавяд. «Даверся мне» (1986).

*Тв.*: Рус. пер. — Кролик, беги; Кентавр; Ферма. Кишинев, 1984.

**АПЕ́ЙКА** Аляксандр Фёдаравіч (н. 13.2.1950, Мінск), бел. вучоны ў галіне механікі трансп. сродкаў. Д-р тэхн. н., праф. (1994). Сын Ф.А.*Апейкі*. Скончыў БПІ (1972). З 1978 у Бел. політэхн. акадэміі. Навук. працы па камп'ютэрным мадэліраванні, сінтэзе сістэм кіравання і аптымізацыі трансп. сродкаў.

*Тв.*: Теория поворота гусеничных машин. М., 1984 (разам з В.У.Гуськовым); Методы моделирования систем с сосредоточенными параметрами // Применение математических методов и ЭВМ: Вычислительные методы проектирования оптимальных конструкций. Мн., 1989.

**АПЕ́ЙКА** Фёдар Аляксандравіч (21.2.1908, Мінск — 29.4.1970), бел. вучоны ў галіне механікі тарфяных машын. Чл.-кар. АН Беларусі (1950), Акадэміі с.-г. навук Беларусі (1959—1961), д-р тэхн. н. (1949), праф. (1950). Скончыў Маскоўскі тарфяны ін-т (1932). Працаваў у Маскве, у 1938—41 і з 1949 у Ін-це торфу АН Беларусі, з 1949 адначасова ў БПІ. Навук. працы па прыкладной механіцы, разліку тарфяных машын і с.-г. тэхнікі, па тэорыі пластычнасці, кантактавай трываласці. Стварыў матэм. тэорыю трэння, спрошчаную тэорыю дакладнасці механізмаў.

*Тв.*: Колесный и гусеничный ход. Мн., 1960; Теория прочности. Мн., 1961; Торфяные машины. Мн., 1968; Математическая теория трения. Мн., 1971.

**АПЕЙРО́Н** (ад грэч. apeiron бязмежнае), тэрмін стараж.-грэч. філасофіі. Уведзены *Анаксімандрам* для абазначэння неакрэсленай, бязмежнай матэрыі, што знаходзіцца ў вечным руху. Усе рэчы і сусвет узніклі шляхам вылучэння з А. процілегласцяў (мокрае і сухое) і іх барацьбы. Важнае дасягненне ў параўнанні з уяўленнямі аб тоеснасці матэрыі з канкрэтным рэчывам (вадой, паветрам). У піфагарэізме А. — бясформенны, неабмежаваны пачатак, разам з процілегласцю — «канцом» — аснова існага.

**АПЕ́КА**, форма аховы асабістых і маёмасных правоў і інтарэсаў недзеяздольных асоб. У Рэспубліцы Беларусь устанаўліваецца над дзецьмі да 15 гадоў, якія не маюць бацькоў або бацькі не здольныя іх выхоўваць, над грамадзянамі, якія прызнаны судом недзеяздольнымі ў сувязі з іх псіхічнай хваробай ці разумовай непаўнацэннасцю. Парадак А. вызначаецца заканадаўствам. Органамі А. з'яўляюцца выканкомы мясц. Саветаў дэпутатаў, якія выконваюць гэтыя функцыі праз аддзелы нар. асветы, аховы здароўя, сац. забеспячэння. Непасрэднае ажыццяўленне А. ускладаецца на апекуна (прызначаецца з ліку сваякоў падапечнага ці інш. грамадзян), пры злоўжыванні правамі апошні нясе маёмасную, у некаторых выпадках і крымінальную адказнасць.

**АПЕ́КА МІЖНАРО́ДНАЯ**, сістэма кіравання былымі залежнымі тэрыторыямі, якая ажыццяўлялася ад імя і пад кіраўніцтвам ААН. Створана ў 1945. Апекавала тэрыторыі, на якія раней распаўсюджвалася мандатная сістэма Лігі Нацый, а пасля 2-й сусветнай вайны былі адарваны ад дзяржаў гітлераўскай кааліцыі і добраахвотна ўвайшлі ў сістэму апекі. Грунтавалася на праве нацый на самавызначэнне, была больш прагрэсіўная па сваіх мэтах і накіравана на ліквідацыю каланіяльнай залежнасці. У сістэму А.м. было ўключана 11 тэрыторый. Кантрольныя функцыі за выкананнем дзяржавамі-апекунамі сваіх абавязкаў ускладаліся на *Савет па апецы ААН* і *Савет Бяспекі ААН*. Прыняцце Ген. Асамблеяй ААН у 1960 Дэкларацыі

Апельсін.

аб прадастаўленні незалежнасці каланіяльным краінам і народам садзейнічала таму, што ўсе падапечныя тэрыторыі да 1994 атрымалі незалежнасць. Такім чынам сістэма А.м. вычарпала свае функцыі. *Л.В.Паўлава.*

**А́ПЕКС** (ад лац. apex вяршыня) у астраноміі, пункт нябеснай сферы, у напрамку да якога перамяшчаецца нябеснае цела ў сваім руху адносна навакольных зорак. Залежыць ад выбару зорак, адносна якіх вызначаецца рух. А. гадавога руху Зямлі вакол Сонца знаходзіцца ў плоскасці экліптыкі пад вуглом, роўным амаль 90° да напрамку Зямля—Сонца, і перамяшчаецца, замыкаючы за год круг. А. руху Сонечнай сістэмы адносна бліжэйшых зорак знаходзіцца ў сузор'і Геркулеса. Процілеглы А. пункт — антыапекс. А. наз. таксама пункт арбіты ШСЗ, найб. аддалены на Пн ад плоскасці зямнога экватара.

**АПЕ́ЛА**, народны сход у стараж. Спарце. Фармальны вышэйшы орган улады, у якім удзельнічалі ўсе паўнапраўныя грамадзяне, якія дасягнулі 30-гадовага ўзросту. А. склікалася штомесячна, выбірала назіральнікаў (эфораў) і членаў савета, прымала рашэнні аб абвяшчэнні вайны, заключэнні ці скасаванні міжнар. дагавораў; галасавалі крыкам. Рашэнні А. адмяняліся, калі савет старэйшын *герусія* ці цар прызнавалі іх шкоднымі для дзяржавы.

Дж.Апдайк.

**А́ПЕЛДОРН** (Apeldoorn), горад у цэнтр. ч. Нідэрландаў. 145 тыс. ж. (1985). Прыстань на Апелдорнскім канале. Чыг. вузел. Машынабудаванне, хім., папяровая, тэкст. прам-сць. Паблізу А. летняя каралеўская рэзідэнцыя; палацы 14 і 17 ст.

**АПЕЛЕ́С** (Apellēs; каля 380—300 да н.э.), старажытнагрэчаскі жывапісец. Працаваў у Эфесе, Косе, Александрыі, быў прыдворным мастаком македонскіх цароў. Пісаў на драўляных дошках тэмперай. Выкарыстоўваў белую, чорную, жоўтую і чырвоную фарбы, віртуозна валодаў святлаценем. Выканаў партрэты Філіпа II і яго сына Аляксандра Македонскага, аўтапартрэт. Найб. вядомая карціна А. «Афрадыта Анадыямена». Работы А. не захаваліся. *Я.Ф.Шунейка.*

**А́ПЕЛЬ** (Appel) Карл Юльянавіч (16.12.1857, Парыж — 1930), польскі і рускі мовазнавец. Выкладаў у гімназіях Варшавы. Працы па вывучэнні слав. моў: «Да славянскага народнага словаўтварэння» (1880), «Нататкі пра старажытнапольскую мову» (1880) і інш. У нарысе «Аб беларускай мове» (1880) разглядаў асн. фанетыка-граматычныя рысы бел. мовы. Паводле агульнамоваznаўчых поглядаў належаў да псіхал. кірунку ў лінгвістыцы. *М.Г.Булахаў.*

**АПЕЛЬБЕ́РГ** Руф Эрнставіч (псеўд. Аляксандраў, Дубровін, Карпаў, Хахракоў; 1860, г. Уладзімір, Расія — 1927 ?), нарадавалец. Вучыўся ў Маскоўскім ун-це. Уваходзіў у нарадавольніцкую групу М.П.Андрэева ў Маскве. З 1881 у Вільні, удзельнічаў у заснаванні Віленскай цэнтр. групы, якая ўзначаліла Паўн.-Зах. арг-цыю «*Народнай волі*». Вёў прапаганду сярод сялян, наладжваў сувязі з рэв. арг-цыямі Польшчы і Прыбалтыкі. У 1882 арыштаваны і са-

сланы ва Усх. Сібір. У 1924 жыў у Казані.

**АПЕЛЬСІ́Н** (Citrus sinensis), вечназялёнае дрэва сям. рутавых. Здаўна культывуецца ў трапічных і субтрапічных краінах (у Кітаі больш за 2 тыс. гадоў, на Чарнаморскім узбярэжжы Каўказа з 11 ст., на Пд Еўропы з 15 ст.). На Беларусі вырошчваюць у аранжарэях і як пакаёвую расліну.

Выш. 7—12 м. Лісце авальнае, кветкі адзіночныя або сабраныя ў суквецці, белыя, пахучыя. Плод — шматгняздовая ягада розных памераў, формы і афарбоўкі скуркі (ад светла-жоўтай да чырвона-аранжавай), сакаўны, салодкі ці кісла-салодкі, масай 100—500 г. Багаты цукрамі, лімоннай к-той, вітамінамі С, групы В, Р. У скурцы да 2% эфірнага алею, які выкарыстоўваецца ў парфюмернай і кандытарскай прам-сці. Меданос. Размнажаецца прышчэпкай на трыфаліяце, памаранцы, сеянцах мясц. сартоў. Цепла- і вільгацелюбівая расліна.

**АПЕЛЯ́ЦЫЯ** (ад лац. appellatio зварот, скарга), у праве многіх краін абскарджанне прыгавораў ці інш. суд. рашэнняў па крымін. і цывільных справах, якія не набылі законнай сілы. Апеляцыйны суд нанава даследуе сабраныя доказы па справе і мае права або зацвердзіць раней прынятае рашэнне, або вынесці новае. Заканадаўства Рэспублікі Беларусь не прадугледжвае А., а перагляд суд. рашэнняў (прыгавораў), якія не набылі законнай сілы, адбываецца ў касацыйным парадку (гл. *Касацыя*). 2) У пераносным сэнсе — просьба падтрымаць у чым-н.

**АПЕНДЫКУЛЯ́РЫІ** (Appendicularia), клас марскіх хордавых жывёл тыпу абалоннікаў. Каля 100 відаў. Жывуць ва ўсіх морах і акіянах у паверхневых слаях вады.

Цела даўж. 0,3 мм — 2,5 см, з тулава і хваста, свецяцца. Маюць хорду, спінны нервовы цяж і мускульныя клеткі, сэрца. Знаходзяцца ў студзяністым празрыстым «доміку», які могуць скідваць. Рухамі хваста праганяюць ваду праз фільтрацыйны апарат. У глотцы пара шчалепных адтулін (стыгмы). Жывяцца мікраарганізмамі. Гермафрадыты. Размнажэнне палавое. Яйцы трапляюць у ваду пасля разрыву сценкі цела, і А. гінуць.

**АПЕНДЫЦЫ́Т**, запаленне чэрвепадобнага адростка (апендыкса) сляпой кішкі ў чалавека. Хварэюць людзі ўсіх узростаў. Асноўнай прычынай А. лічаць пераход мікраарганізмаў, што пастаянна прысутнічаюць у адростку, у стан хваробатворных (напр., пры затрымцы ў сляпой кішцы і апендыксе калавых масаў), запаўненне апендыкса дробнымі глістамі, закупорка яго прасвету іншароднымі целамі ці камячкамі цвёрдага калу і парушэнне такім чынам яго апаражнення. А. часам бывае пры парушэнні кровазвароту ў сценках апендыкса пры раздражненні нерв. сістэмы. Спрыяюць развіццю А. вяласць кішэчніка, сістэматычнае ўжыванне ў ежу вял. колькасці мясных прадуктаў, перагрузка стрававальна-кішачнага тракту бялкамі. Асн. прыкметы в о с т р а г а А. — рэзкі або паступовы з хуткім нарастаннем боль унізе (справа) жывата, млявасць, ірвота, павышэнне т-ры (не заўсёды) да 37,5—38,5 °С. Небяспечны амярцвеннем адростка (гангрэнозны А.), расплаўленнем і прабадзеннем яго сценак (прабадны, або перфарацыйны, А.) з пераходам запалення на брушыну і развіццём цяжкага перытаніту. Неабходна неадкладнае хірург. выдаленне апендыкса. Х р а н і ч н ы А. можа праяўляцца пастаяннымі або перыядычнымі болямі ў вобласці сляпой кішкі, запорамі, млявасцю. Небяспечны пераходам у вострую форму. Рэкамендуецца хірург. лячэнне.

**АПЕНІ́НСКАЯ КУЛЬТУ́РА**, археалагічная культура плямёнаў бронзавага веку (2-я пал. 2-га тыс. да н.э.), што жылі ў Італіі. Назва ад Апенінскага п-ва. Насельніцтва займалася пераважна жывёлагадоўляй на высакагорных



Апендыкулярыя.

пашах, жыло ў пячорах і на ўмацаваных паселішчах. Прылады вырабляліся з косці, рогу і каменю; бронзавыя рэчы трапляюцца адносна рэдка. Характэрны групавыя пахаванні паводле абраду трупапалажэння. Кераміка — цемнаглянцавая, упрыгожаная стужачным арнаментам з белай інкрустацыяй.

Тыповы ландшафт у Апенінах.

**АПЕНІ́НСКІ ПАЎВО́СТРАЎ**, паўвостраў на Пд Еўропы. Пл. 149 тыс. км$^2$. Працягласць з ПнЗ на ПдУ 1100 км, шыр. 130—300 км. На Пн абмежаваны Падунскай нізінай, на У абмываецца Адрыятычным, на Пд — Іанічным, на З — Тырэнскім і Лігурыйскім морамі. Берагі парэзаны слаба, больш расчлянёныя ў паўд. ч. (п-вы Калабрыя, Саленціна, Гаргана). Большая ч. А.п. занята сярэдневышыннымі маладымі складкавымі гарамі *Апенінамі*. Уздоўж усх. і зах. ўзбярэжжаў невял. палосы хвалістых раўнін. На ПдЗ раён стараж. і сучаснага вулканізму і землетрасенняў (Везувій, Флегрэйскія палі і інш.). Паўд. ч. А.п. займаюць Калабрыйскія горы. Карысныя выкапні: буры вугаль, ртуць, пірыты, баксіты, мармур, тэрмальныя крыніцы. Клімат субтрапічны міжземнаморскі, з гарачым летам і дажджлівай зімой, у гарах — рысы ўмеранага і халоднага. Рэкі (асн. Тыбр, Арна) кароткія, летам моцна мялеюць. Для расліннасці гор характэрна вышынная пояснасць, лісцевыя лясы і міжземнаморскія вечназялёныя хмызнякі (маквіс, гарыга); на нізінах — культ. ландшафты: палі пшаніцы, вінаграднікі, алейныя і фруктовыя плантацыі (апельсіны, лімоны, міндаль, масліны і інш.). Жывёльны свет: воўк, серна, казуля, куніца, ласка, вавёрка; шмат паўзуноў і птушак. На А.п. дзяржавы: большая ч. Італіі, Сан-Марына і Ватыкан.

*А.М.Баско.*

**АПЕНІ́НЫ**, А п е н і н с к і я г о р ы (Appennino), горная сістэма на Апенінскім п-ве ў Італіі. Працягласць каля 1200 км з ПнЗ на ПдУ ад Альпаў да Месінскага праліва. Сярэдневышынныя горы (пераважныя выш. 1200—1800 м), складаюцца з асобных, б.ч. паралельных хрыбтоў і ўзгорыстых перадгор'яў. Выш. да 2914 м (г. Корна). Адзіны невял. ледавік у масіве Гран-Саса-д'Італія. Паводле геал. будовы і рэльефу падзяляюцца на Паўн. А. (Лігурыйскія і Таскана-Эміліянскія), Цэнтр. А. (Умбра-Маркскія і Абруцкія) і Паўд. А. (Неапалітанскія і Луканскія). Пераважаюць параўнальна спадзістыя схілы, сталовыя горы, купалападобныя граніта-гнейсавыя масівы. У Цэнтр. А. хрыбты скалістыя, са стромкімі схіламі, старажытналедавіковымі і карставымі формамі рэльефу. На У гал. ланцугі А. суправаджаюцца шырокай паласой узгорыстых перадгор'яў, за якой уздоўж берагоў Адрыятычнага м. ўзвышаюцца вапняковыя плато п-воў Гаргана і Саленціна. Зах. схіл А. больш стромкі, скідавы; на З ад Цэнтр. А. шырокая перадгорная паласа з асобнымі невысокімі хрыбтамі, вулканічнымі масівамі (у т.л. Везувій, Флегрэйскія палі), туфавымі плато. А. ўтварыліся ў выніку альпійскага арагенезу. Тэктанічныя працэсы працягваюцца, аб чым сведчаць землетрасенні і

вулканічная дзейнасць. Карысныя выкапні: буд. і вырабны камень, ртуць, буры вугаль і лігніт, бітумінозныя сланцы, баксіты, прыродны газ, нафта, тэрмальныя воды. Клімат субтрапічны міжземнаморскі, на ўсх. схілах і ў катлавінах з рысамі кантынентальнага. Ападкаў на зах. схілах 1000—2000 мм за год (у Лігурыйскіх А. да 3000 мм), на ўсх. схілах і ў замкнутых катлавінах 600—800 мм. Сярэдняя т-ра студз. каля падножжа гор на Пн 0 °С, на Пд да 11 °С. Сярэдняя т-ра ліп. на Пн 24 °С, на Пд да 28 °С. У гарах вышэй за 2000 м 180—190 сут за год ляжыць снег. Рэкі мнагаводныя восенню і зімой, найб. Тыбр, Арна. Да выш. 300—500 м на Пн і 600—800 м на Пд на схілах гор палі, сады, вінаграднікі, аліўкавыя насаджэнні, месцамі гаі каменнага і коркавага дубу, алепскай хвоі, піній, вечназялёныя хмызнякі (маквіс, гарыга); глебы пераважна карычневыя. Да выш. 900 м на Пн і 1000—1200 м на Пд — мяшаныя лясы з дубу, хвоі, каштану і інш., хмызнякі, пусткі; глебы горныя буразёмы і перагнойна-карбанатныя. Вышэй за 900 м на Пн, 1000—1200 м на Пд — букавыя і хвойныя (піхта, хвоя) лясы на горных буразёмах і горных падзолістых глебах. На найб. высокіх хрыбтах (вышэй за 2000—2500 м) участкі субальпійскіх і альпійскіх лугоў. Жывёльны свет збяднелы ў сувязі з дзейнасцю чалавека. Трапляюцца воўк, буры мядзведзь, сарна, лань, дзікабраз, шмат паўзуноў і птушак (беркут і інш.). Земляробства ў горных далінах і катлавінах, каля падножжа гор. Рэкі выкарыстоўваюцца для арашэння і выпрацоўкі электраэнергіі. Турызм. *А.М.Баско.*

**АПЕ́НЬКА** (Armillaria), род базідыяльных грыбоў парадку агарыкальных. Каля 12 відаў. Касмапаліты. На Беларусі трапляюцца А. сапраўдная, або восеньская (A. mellea), А. марнеючая (A. tabescens) і А. скараспелая, або ранняя (A. praecox). Факультатыўныя паразіты (на старых або аслабленых дрэвах), часцей існуюць як *сапратрофы*. Растуць групамі на пнях, ствалах, каля дрэў у хвойных і лісцевых лясах. Ядомыя (спажываюцца смажаныя, вараныя, салёныя, сушаныя і марынаваныя).

Шапка ў маладых А. выпуклая, пазней плоская, гладкая або лускаватая, сухая, зрэдку слізістая, дыям. да 12 см, жоўта-бурая або жаўтавата-карычневая. Пласцінкі жоўта-белыя, бураватыя. Ножка з добра выяўленым кольцам, рэдка без яго. А. часта наз. грыбы інш. родаў, напр. ядомая А. летняя (Kuehneromyces mutabilis), а таксама ядавітыя А. несапраўдная серна-жоўтая (Nematoloma fasciculare) і А. несапраўдная цагельна-чырвоная (N. sublateritium). *В.С.Гапіенка.*

**АПЕРА́НД** (англ. operand) у вылічальнай тэхніцы, частка машыннай каманды, што вызначае аб'ект, над якім выконваецца аперацыя ў працэсе выканання зададзенай праграмы; аргумент *аперацыі*. Напр., А. арыфм. аперацый звычайна з'яўляюцца лікі: пры складанні — складнікі, пры множанні — сумножнікі.

**АПЕРА́ТАР** (ад лац. operator які дзейнічае), 1) у матэматыцы — адпаведнасць паміж элементамі двух мностваў X і Y (кожнаму элементу x з X адпавядае пэўны элемент y з Y). Раўназначныя паняцці: адлюстраванне, ператварэнне, функцыя, функцыянал. Важны клас А. — лінейныя А. ў *лінейнай алгебры і функцыянальным аналізе*. Дыферэнцыяльнымі і інтэгральнымі А. карыстаюцца ў матэм. фізіцы, тэорыі дыферэнцыяльных і інтэгральных ураўненняў і інш. Напр., А. дыферэнцавання $A f(x) = \frac{d f(x)}{d x}$; інтэгральны $A f(x) = \int_a^b K(x, x') f(x') d x'$; зруху $Af(x)=f(x+a)$. Да логікавых А. адносяцца кан'юнкцыя, дыз'юнкцыя, імплікацыя, адмаўленне, квантары агульнасці і існавання. 2) У вылічальнай тэхніцы — прадпісанне на мове праграмавання закончанага дзеяння ў праграме, напр. прысваенне лікавага значэння пераменнай велічыні, перадача кіравання, выклік падпраграмы, цыкл. 3) У тэхніцы — спецыяліст, які кіруе з пульта абсталяваннем, напр. ЭВМ, радыёлакацыйнай станцыяй. *М.П.Савік.*

Апенькі: 1 — летняя; 2 — восеньская.

**АПЕРА́ТАРСКАЕ МАСТА́ЦТВА**, від творчасці ў кінематаграфіі і на тэлебачанні, майстэрства сродкамі кіназдымкі рэалізаваць ідэі літаратурнага сцэнарыя і творчай задумы рэжысёра.

Узнікла і развілося са станаўленнем *кінамастацтва*. Першыя здымкі ажыццявілі ў Францыі ў 1895 браты *Люм'ер*. З развіццём кінематографа фарміраваліся і выяўл. сродкі А.м.: кампазіцыя кадра, прасторы, асвятленне, ракурс, прыёмы дынамічнай здымкі, аптычны малюнак кадра, святлотанальнае і колеравае вырашэнне эпізодаў. Значныя работы з'явіліся ў Італіі, ЗША, Германіі, Швецыі, Даніі. У 1920-я г. фарміравалася сав. школа А.м. (*Э.Цісэ*, А.Галаўня, *А.Масквін*, Д.Дэмуцкі і інш.). У 1920—30-я г. ў стварэнні цэласнага выяўл. вобраза фільма вызначыліся франц. аператары Ж.Перыналь, Р.Матэ, Б.Каўфман, амер. Дж.Арналд, Б.Рэйналдс, Х.Расан; у распрацоўцы і выкарыстанні колеру ў кіно — амер. аператар Р.Рэнахен, сав. аператар Ф.Праворaў.

У 1930-я г. са з'яўленнем гуку кінааператары асвойвалі новыя маст.-творчыя тэхналогіі і формы выяўл. арганізацыі матэрыялу. Павялічылася ўвага да псіхал. партрэтных характарыстык персанажаў. У 1940—60-я г. стылістыка майстроў зах. кінематографа выявілася ў творчай практыцы *неарэалізму*. Аператары франц. «новай хвалі» выкарыстоўвалі здымкі рухомай камерай у натуральным асяроддзі, імправізаваную кампазіцыю кадра. На аснове новай тэхнікі, матэрыялаў і тэхналогій 1960—90-х г. пашырылася фарміраванне індывід. стыляў у А.м. Сярод найб. вядомых майстроў: Г.Толанд, Х.Уэкслер, Л.Ковач, Дж.Тэйлар (ЗША), Ю.Стрындберг, С.Нюквіст (Швецыя), Э.Рышар, Н.Альмендрас, П.Глен (Францыя), В.Старара, Т.Дэлі Колі, Дж.Ратуна, П. дэ Сантыс, Л.Таволі (Італія), Дж.Олкат, Дж.Ансварт, Д.Слокам (Вялікабрытанія), Л.Ахвледзіяні, А.Булінскі, К.Кыдыраліеў, П.Лебешаў, Р.Масальскі, М.Мусаеў, В.Нікалаеў, Л.Пааташвілі, М.Піліхіна, Г.Рэрберг, Ю.Сіларт, С.Урусеўскі, Х.Файзіеў, В.Юсаў (СССР).

На Беларусі першыя маст. фільмы ў 1920—30-я г. здымалі аператары Д.Шлюглейт («Лясная быль»), М.Казлоўскі («Хвоі гамоняць»), Н.Навумаў-Страж («Жанчына»), А.Кальцаты («Першы ўзвод»), Б.Рабаў («Двойчы народжаны»). Сталым А.м. вызначаюцца лепшыя фільмы канца 1940—50-х г., якія знялі А.Булінскі («Дзеці партызана»), А.Гінцбург («Канстанцін Заслонаў»), Г.Удавянкоў («Міколка-паравоз»), У.Акуліч («Гадзіннік спыніўся апоўначы»), А.Аўдзееў і І.Пікман («Дзяўчынка шукае бацьку»). Выкарыстанне з сярэдзіны 1950-х г. шырокіх і шырокафарматных экранаў павялічыла выяўл. магчымасці А.м. У 1960—80-я г. А.м. бел. майстроў вызначалі паэт. светаадчуванне (А.Забалоцкі — «Праз могілкі», «Альпійская балада»), псіхалагізм і выразнасць кампазіцыі (Ю.Марухін — «Магіла льва», «Паводка»), тонкае адчуванне прыроды (Дз.Зайцаў — «Рудабельская рэспубліка», «Людзі на балоце»), дакладнае адчуванне колеру (Э.Садрыеў — «Жыццё і смерць дварaніна Чартапханава», «Хлеб пахне порахам»), дынамізм і лірызм (Т.Логінава — «Вянок санетаў», «Дзікае паляванне караля Стаха»), завершанасць кампазіцыйных рашэнняў (Ю.Ялхоў — «Раскіданае гняздо», «Франка — жонка Хама»). *Г.В.Ратнікаў.*

**АПЕРА́ТАРЫ** ў квантавай механіцы, матэматычныя аперацыі, якія выконваюцца над *хвалевай функцыяй*, што апісвае стан сістэмы. Служаць для супастаўлення з зададзенай хвалевай функцыяй (вектарам стану) $\Psi$ інш. функцыі $\Psi' : \Psi' = \hat{L}\Psi$, дзе $\hat{L}$ — А.,

якому адпавядае фіз. велічыня L. Напр., А. множання $\hat{x}\Psi = x$, дзе x — А. каардынаты; дыферэнцавання $\hat{P}_x\Psi = -ih\frac{\partial\Psi}{\partial x}$, дзе $\hat{P}_x$ — А. праекцыі імпульсу на вось x. Над А. можна выконваць алг. дзеянні, напр., здабыткам $\hat{L} = \hat{L}_1\hat{L}_2$ азначае, што $\hat{L}_\varphi = \Psi''$, калі $\hat{L}_1\Psi = \Psi'$ і $\hat{L}_2 tp' = \Psi''$. Яўны выгляд А. вызначаецца ўласцівасцямі пераўтварэнняў той сіметрыі, з якой звязана матэм. фармулёўка адпаведнага закону захавання (гл. *Нётэр тэарэма*). Уласцівасці А. $\hat{L}$ вызначаюцца ўраўненнем $\hat{L}\Psi = L_n\Psi_n$; яго рашэнні $\Psi_n$ (уласныя функцыі) апісваюць квантавыя станы, у якіх фіз. велічыня L прымае значэнні $L_n$ (уласныя значэнні А.). Набор такіх значэнняў (спектр) вызначае ўсе значэнні фіз. велічыні L, якія можна вызначыць эксперыментальна, бывае неперарыўным (напр., А. каардынат, імпульсу), дыскрэтным (А. праекцыі моманту імпульсу на каардынатную вось) і змешаным (А. энергіі ў залежнасці ад характару сіл, што дзейнічаюць у сістэме; дыскрэтныя ўласныя значэнні А. наз. ўзроўнямі энергіі). У квантавай механіцы карыстаюцца пераважна *лінейнымі аператарамі* і *эрмітавымі аператарамі*. *А.А.Богуш.*

**АПЕРАТЫ́ЎНАЕ КІРАВА́ННЕ**, сістэма кіравання вытворчымі, сацыяльнымі і інш. аб'ектамі для аператыўнага забеспячэння іх функцыянавання ў адпаведнасці з пастаўленай мэтай. Аб'екты А.к. — розныя бакі вытв. і сац. працэсаў: напр., работа зборачнага цэха, пастаўка сыравіны, збыт прадукцыі, вырашэнне жыллёва-бытавых праблем і інш. Яго сутнасць — мэтавае накіраванне працэсу прычынна-выніковых сувязяў і ўзаемадзеянне элементаў у аб'екце кіравання. А.к. ўключае: аператыўнае планаванне (распрацоўка аператыўных планаў, праграм, нормаў, нарматываў з давядзеннем заданняў да выканаўцаў), аператыўны ўлік (адлюстраванне вынікаў вытв. ці сац. працэсаў), аператыўны аналіз (своечасовае выяўленне і вымярэнне фактараў, якія выклікаюць адхіленні ад планавых заданняў, гл. *Аналіз гаспадарчай дзейнасці*), аператыўнае рэгуляванне (выпрацоўка кіраўніцкіх рашэнняў і арганізацыя іх выканання для ліквідацыі прычын адхілення працэсу ад запланавых параметраў). Практычна А.к. пачынаецца з аператыўнага планавання, затым на працягу кароткага часу (дэкады, тыдня, сутак, змены і інш.) фіксуюцца вынікі вытв. працэсу, на аснове якіх выяўляюцца прычыны збояў і адхілення ад планавых заданняў і прымаецца рашэнне па рэгуляванні вытв. ці сац. працэсаў у адпаведнасці з планам. У сістэму А.к. ўваходзяць функцыі, якія выконваюць дапаможную ролю ці стымулююць дзейнасць спецыялістаў (арганізацыя, каардынацыя, кантроль, матывацыя і інш.).

*Літ.:* Стражев В.И. Оперативное управление предприятием, проблемы учета и анализа. Мн., 1973; Саламатин Н.А., Фель А.В., Шишкина Е.Л. Оперативное управление производством. М., 1993.

*В.І.Стражаў.*

**АПЕРАТЫ́ЎНАЕ МАЙСТЭ́РСТВА**, састаўная частка ваеннага майстэрства, якая ахоплівае пытанні тэорыі і практыкі падрыхтоўкі і правядзення самастойных і сумесных аперацый і баявых дзеянняў аператыўных аб'яднанняў розных відаў узбр. сіл. Даследуе і распрацоўвае арганізацыю ўзаемадзеяння, усебаковага забеспячэння войскаў (сіл) і кіраванне імі і інш. Гл. ў арт. *Ваеннае майстэрства.*

**АПЕРАТЫ́ЎНА-ЭКАНАМІ́ЧНЫ АНА́ЛІЗ**, гл. *Аператыўны аналіз.*

**АПЕРАТЫ́ЎНАЯ СУ́ВЯЗЬ** у кіраванні, хуткая перадача і прыём дзелавой інфармацыі, звязанай з працоўнай дзейнасцю прадпрыемстваў, устаноў і інш. Забяспечваецца сродкамі аргтэхнікі. Бывае бездакументальная (тэлефонная, радыёсувязь і інш.) і дакументальная (тэлегр., фотатэлегр. сувязь, факс, пнеўмапошта і інш.).

**АПЕРАТЫ́ЎНЫ АНА́ЛІЗ**, сістэма хуткага даследавання кароткатэрміновых вынікаў вытв.-гасп. дзейнасці і сац. развіцця з мэтай іх рэгулявання ў аператыўным цыкле кіравання. Накіраваны на выяўленне і вымярэнне кароткатэрміновых прычынна-выніковых сувязяў, якія абумоўліваюць змены адпаведных аб'ектаў аператыўнага кіравання. Ажыццяўляецца на аснове звестак *аператыўнага ўліку*, як правіла, за дэкаду, тыдзень, суткі, змену і больш кароткія адрэзкі часу. У адрозненне ад інш. відаў сац.-эканам, аналізу А.а. мае характэрныя рысы: выкарыстоўваецца толькі ў аператыўным кіраванні; дае інфармацыю для кіраўніцкіх рашэнняў па ўздзеянні на кароткатэрміновыя прычыны, што выклікаюць адхіленні ад зададзеных параметраў; выкарыстоўвае індуктыўны метад даследавання; даследуе адхіленні толькі ў пэўных (вузкіх) межах. Адрозніваюць: аператыўны тэхн. аналіз (даследуе кароткатэрміновыя прычынна-выніковыя сувязі, якія ўплываюць на фарміраванне і змену натуральных паказчыкаў гасп. дзейнасці: штомесячны аналіз уборкі збожжа, выпуску прадукцыі і г.д.), аператыўны эканам. аналіз (тыя ж сувязі, паказчыкі, але ў вартасным — грашовым выражэнні: штомесячны аналіз сабекошту прадукцыі і інш.); аператыўны аналіз асобных бакоў сац. сферы дзейнасці (напр., аналіз аварыйных сітуацый).

*В.І.Стражаў.*

**АПЕРА́ЦЫЙ ДАСЛЕ́ДАВАННЕ**, метад распрацоўкі колькасна абгрунтаваных рэкамендацый па прыняцці аптымальных рашэнняў па арганізацыі і кіраванні дзеяннямі (аперацыямі). Навукова аформілася для рашэння тэхн., тэхніка-эканам. задач і задач кіравання ў канцы 1940-х г.

У кожнай задачы А.д. фармальна апісана мноства магчымых рашэнняў і вызначанай мэтавай функцыі, значэнні якой характарызуюць меру дасягнення мэты пры кожным магчымым рашэнні. Задачы А.д. бываюць статычныя і дынамічныя, дэтэрмінаваныя і стахастычныя. У статычных задачах мэтавая функцыя яўна не залежыць ад часу, у дынамічных — час мае істотнае значэнне, у дэтэрмінаваных — выбар канкрэтнага рашэння прыводзіць да пэўнага значэння мэтавай функцыі, у стахастычных — гал. ролю адыгрывае фактар выпадковасці. Пры рашэнні статычных дэтэрмінаваных задач карыстаюцца метадамі лінейнага і нелінейнага праграмавання, дынамічных дэтэрмінаваных — дынамічнага праграмавання, стахастычных — тэорыі імавернасцяў, матэм. статыстыкі, тэорыі масавага абслугоўвання, стат. тэорыі прыняцця рашэнняў. Задачы, у якіх сутыкаюцца інтарэсы двух і больш бакоў, рашаюцца метадамі тэорыі гульняў. Калі дакладнае рашэнне задачы немагчыма, карыстаюцца метадам стат. выпрабаванняў (гл. *Монтэ-Карла метад*). Для рашэння складаных задач распрацаваны пакеты праграм для ЭВМ. Гл. таксама *Аптымізацыі задачы і метады.* *М.А.Лепяшынскі.*

**АПЕРАЦЫ́ЙНАЕ ЗЛІЧЭ́ННЕ**, метад *аналізу матэматычнага*, які дае магчымасць зводзіць рашэнне складаных матэм. задач да больш простых. У аснову закладзена замена па пэўных правілах зададзеных функцый (арыгіналаў) f(t) інш. функцыямі (вобразамі) камплекснай пераменнай F(s); пры гэтым аперацыя дыферэнцавання пераходзіць у аперацыю множання на s, інтэгравання — дзялення на s, дыферэнцыяльныя і інтэгральныя ўраўненні — у алг. ўраўненні і інш.

Англ. вучоны О.Хевісайд прапанаваў у 1892 фармальныя правілы карыстання *аператарам* p=d/dt і некаторымі функцыямі гэтага аператара, з дапамогай чаго вырашыў шэраг задач электрадынамікі. Абгрунтаванне А.л. праводзіцца на аснове інтэгральнага *Лапласа пераўтварэння*. Аперацыі знаходжання вобразаў па арыгіналах (і наадварот) забяспечаны спец. табліцамі. Найбольш агульныя вынікі А.л. атрыманы на аснове тэорыі абагульненых функцый. Далейшае развіццё ідэі А.л. атрымалі ў функцыянальным злічэнні аператараў, сімвалічным злічэнні псеўдадыферэнцыяльных аператараў. Распрацаваны абагульненні А.л. на аснове пераўтварэнняў Фур'е і Меліна; для інш. дыферэнцыяльных аператараў.

*Літ.:* Диткин В.А., Прудников А.П. Интегральные преобразования и операционное исчисление. 2 изд. М., 1974.

*А.Б.Антаневіч.*

**АПЕРАЦЫ́ЙНАЯ СІСТЭ́МА**, комплекс праграм на ЭВМ, якія забяспечваюць усе працэсы пры выкананні любой праграмы карыстальніка. Пастаянна знаходзіцца ў памяці машыны, звязвае ўсе яе вузлы ў адзінае цэлае, забяспечвае эфектыўнае выкарыстанне выліч. сістэмы і шырокі набор паслуг. Складанасць і структура А.с. залежаць ад функцый і характарыстык працэсараў, сістэмы камандаў, спосабу размяшчэння праграм у памяці, прыстасаванняў уводу-выводу інфармацыі, метадаў доступу да выліч. сістэмы і інш. Тэарэт. аснову распрацоўкі А.с. складаюць *гра-*

*фаў тэорыя, масавага абслугоўвання тэорыя* і інш. Апаратныя сродкі і матэм. забеспячэнне ствараюцца для пэўнай А.с., якая складаецца са стартавай праграмы (запуск ЭВМ і яе самаканторль; кантролеры знешніх прыстасаванняў), дыспетчара (устанаўлівае чарговасць выканання праграм), рэдактара (работа са структурнымі аб'ектамі), адміністратара (улік часу работы працэсара і выкарыстанне памяці) і інш. *М.П.Савік.*

**АПЕРА́ЦЫЯ** (ад лац. operatio дзеянне), 1) закончанае дзеянне або шэраг дзеянняў, накіраваных на дасягненне пэўнай мэты (напр., *аперацыя ваенная*); асобная закончаная частка тэхнал. працэсу, якая выконваецца на адным рабочым месцы (напр., *аперацыя вытворчая*). 2) Асобнае дзеянне сярод многіх іншых; выкананне якой-н. фін., крэдытнай, прамысл., гандл., страхавой або інш. задач, напр., банкаўская А., паштовая А. 3) У выліч. тэхніцы выкананне лічбавай выліч. машынай якога-н. дзеяння з зыходнымі велічынямі, напр., арыфм. А.

**АПЕРА́ЦЫЯ ВАЕ́ННАЯ**, сукупнасць узгодненых і ўзаемазвязаных па мэце, месцы і часе баявых дзеянняў войскаў аднаго або розных відаў паводле адзінай задумы і плана. Паводле маштабу бываюць стратэгічныя, франтавыя (флоту, акругі ППА, групы армій), армейскія (флатыліі, корпуса, эскадры); у залежнасці ад сіл і сродкаў — агульнавайсковыя (агульнафлоцкія), паветраныя, проціпаветраныя, паветрана-дэсантныя, сумесныя і самастойныя; па характары баявых дзеянняў — наступальныя і абарончыя.

Першыя элементы А.в. як формы вядзення баявых дзеянняў выявіліся ў войнах канца 18 — пач. 19 ст., калі значна павялічылася рухомасць войскаў, баявыя дзеянні сталі весціся на шырокіх франтах адначасова на некалькіх напрамках, на вял. глыбіню і ўзнікла неабходнасць больш аператыўнай каардынацыі гэтых дзеянняў. На тэр. Беларусі прыкметы А.в. выявіліся, напр., у дзеяннях рус. войскаў супраць франц. у 1812, калі цэнтр., паўд. і паўн. групоўкам была пастаўлена задача аб'яднацца на р. Бярэзіна з мэтай акружэння і разгрому рэшткаў арміі Напалеона I. Буйнейшыя А.в. 2-й сусв. вайны: дзеянні войскаў гітлераўскай Германіі супраць Польшчы (1939) і Францыі (1940); сав. войскаў у аперацыі пад Масквой, Сталінградам і на Курскай дузе, Беларускай, Берлінскай і інш.; саюзнікаў — *Нармандская дэсантная аперацыя* (1944) і інш.

На сучасным этапе характар А.в. змяніўся: павялічыліся глыбіня і шырыня наступлення і абароны, пабольшалі задачы і тэмпы наступлення, больш сціслым стаў час вядзення баявых дзеянняў.

**АПЕРА́ЦЫЯ ВЫТВО́РЧАЯ**, адасобленая і закончаная частка (элемент) вытв. працэсу. Выконваецца адным ці групай рабочых на адным *рабочым месцы* пры нязменным прадмеце працы. Асн. разліковая адзінка для вызначэння прадукцыйнасці працы, тэхн. нарміравання, загрузкі і выкарыстання абсталявання. Змест А.в. залежыць ад прадукцыі, якая вырабляецца, матэрыялаў і тэхнал. метадаў вытворчасці. Адрозніваюць аперацыі ручныя, механізаваныя, машынныя, аўтаматызаваныя і інш. Падзяляюцца на тэхнал. (асноўныя), дапаможныя і абслуговыя.

Тэхналагічная аперацыя накіравана на змену якаснага стану, формы, памеру ці становішча ў прасторы прадмета працы з мэтай атрымання прадуктаў працы. Дапаможныя аперацыі — выраб на ўласныя патрэбы прадпрыемства аснасткі, інструменту, рамонт абсталявання, будынкаў і інш. Абслуговыя аперацыі забяспечваюць асн. і дапаможныя вытв. працэсы матэрыяламі, паўфабрыкатамі, энергіяй, транспартам, кантрольнымі, лабараторна-выпрабавальнымі і доследнымі работамі. Шырока выкарыстоўваецца метад сумяшчэння А.в., што спрыяе росту прадукцыйнасці працы; з сукупнасці іх фарміруюцца тэхнал. цыклы. *Р.М.Шахлевіч.*

**АПЕРА́ЦЫЯ ХІРУРГІ́ЧНАЯ**, асноўны метад лячэння *хірургічных хвароб*, пры якім паталагічныя ачагі ліквідуюцца, лакалізуюцца або даследуюцца з дапамогай спец. *хірургічных інструментаў*. Можа суправаджацца нанясеннем ран, значнымі аб'ёмамі рассячэння тканак з крывацёкам, які спыняюць штучна (пры рэзекцыі страўніка ці кішэчніка, аперацыях на лёгкіх, сэрцы і інш. унутраных органах), або ашчадным унутраным умяшаннем і нязначнымі крывастратамі (пры *біяпсіі, мікрахірургіі*, лазерным лячэнні, упраўленні вывіхаў суставаў, састаўленні касцявых абломкаў і інш.). А.х. з нанясеннем раны і рассячэннем тканак бываюць: радыкальныя, калі паталаг. ачаг (язва, пухліна, орган) выдаляецца поўнасцю або часткова; паліятыўныя, якія аблягчаюць стан хворага; дыягнастычныя — для высвятлення прычыны захворвання, калі яе нельга ўстанавіць дакладна інш. метадамі. Памяншэнне страт крыві пры А.х. дасягаецца перавязкай (лігіраваннем) рассечаных сасудаў або каагуляваннем з дапамогай электранажоў, лазерных, плазмавых скальпеляў і інш. Характар паталогіі вызначае мэту А.х.: ускрыццё паталаг. ачага (гнайнікоў, абсцэсаў), частковае (*рэзекцыя*) або поўнае (*экстырпацыя*) выдаленне пухліны і пашкоджаных тканак, частковую або поўную *ампутацыю* органаў (напр., канечнасцяў), *трансплантацыю* органаў і тканак, аднаўленне іх функцый (*пластычныя аперацыі, касметычныя аперацыі*). Раны пры А.х., як правіла, зашываюць, склейваюць, радзей пакідаюць адкрытымі. Сучасная *хірургія* скіравана на распрацоўку найб. ашчаджальных для арганізма А.х. на аснове выкарыстання найноўшых тэхн. дасягненняў. Да іх належаць А.х. эндаскапічныя, тэлеэндаскапічныя, мікрахірургічныя.

Эндаскапічныя аперацыі робяць з выкарыстаннем спец. валаконнай тэхнікі (эндаскопаў), што дазваляе бачыць «на вока» структуры стрававальнага тракту, поласцевыя ўтварэнні. Некаторыя маюць прыстасаванні для выдалення паліпаў страўніка, кішэчніка, камянёў з мачавога пузыра і жоўцевывадных пратокаў, каб узяць кавалачак тканкі на мікраскапічнае даследаванне. Аперацыі тэлеэндаскапічныя базіруюцца на эндаскапічнай тэхніцы, дзе адлюстраванне выводзіцца на тэлеэкран, што дазваляе бачыць орган у 10—20 разоў павялічаны. Тэлевізійная камера праз праколы ў тканках уводзіцца ў орган. Пад яе кантролем уводзяць хірург. інструменты. Мікрахірургічныя аперацыі праводзяцца пад кантролем спец. двух-, трохакулярных аперацыйных мікраскопаў на дробных сасудах, пры рэплантацыі канечнасцяў, іх сегментаў, самых складаных аперацыях у хірургіі вока, перасадцы складаных скурна-падскурна-мышачных ласкутоў у пластычнай хірургіі пры лячэнні дэфектаў тканкі, астэаміэліту, пры стварэнні органаў (лячэнне транссексуалізму) і інш. Аперацыі пад кантролем тэлевізійных камп'ютэраў робяць на дробных структурах (жоўцевывадных шляхах, матачных трубах і інш. органах), якія ў павялічаным выглядзе перадаюцца на тэлевізійную ўстаноўку. На Беларусі такі метад выкарысталі І.М.Грышын і В.М.Стасевіч (1994). *І.М.Грышын.*

**АПЕРО́Н** (ад лац. operare працаваць, дзейнічаць), участак генетычнага матэрыялу з аднаго, двух і больш счэпленых *структурных генаў*, якія кадзіруюць бялкі (ферменты), што ажыццяўляюць паслядоўныя этапы біясінтэзу якога-н. метабаліту. У А. ўкарыёт уваходзіць, як правіла, адзін структурны ген. Рэгулятарныя элементы А. складаюць таксама праматар (участак малекулы ДНК, з якім спецыфічна звязваецца фермент РНК-палімераза, што ажыццяўляе *транскрыпцыю* А.) і аператар (участак ДНК, які нясе функцыю «ўключэння» або «выключэння» структурных генаў і рэгулюе функцыянальную актыўнасць А.). Канцэпцыя А. распрацавана франц. вучонымі Ф.Жакобам і Ж.Мано (1961) для тлумачэння механізму рэгуляцыі сінтэзу бялку ў бактэрыяльных клетках.

Рэгулятарная функцыя А. адбываецца на стадыі транскрыпцыі і забяспечвае каардынацыю сінт. працэсаў і адпаведныя рэакцыі клеткі на ўплыў навакольнага асяроддзя. Кантралюе дзейнасць А. ген-рэгулятар, які можа знаходзіцца ў розных участках храмасомы. Яго прадукт — бялок-рэгулятар — пастаянна сінтэзуецца ў клетцы ў не-




Да арт. **Аперон.** Асноўныя структуры і працэсы, якія ўдзельнічаюць у рэгуляцыі біясінтэзу бялкоў — ферментаў паводле гіпотэзы Жакоба — Мано. Лічбы паказваюць паслядоўнасць працэсаў.

вял. колькасці і здольны ўзаемадзейнічаць з двума рознымі субстратамі, з аператарам і эфектарам (нізкамалекулярным рэчывам). У рэпрэсібельных сістэмах комплекс бялку-рэгулятара з эфектарам набывае роднасць з аператарам і далучаецца да яго, у выніку адбываецца выключэнне генаў, якія кіруюцца гэтым аператарам. У індуцыбельных сістэмах эфектар, які далучаецца да бялку-рэгулятара, вызваляе аператар ад гэтага бялку. Такім чынам, запускаюцца ў работу гены, падпарадкаваныя дадзенаму аператару.

**АПЕРТУ́РА** (ад лац. apertura адтуліна), дзейная адтуліна аптычнай сістэмы, якая вызначаецца памерамі лінзаў або дыяфрагмамі. *Раздзяляльная здольнасць* аптычнай прылады прапарцыянальная А. Вуглавая А. — вугал $\alpha$ паміж крайнімі прамянямі канічнага светлавога пучка, які ўваходзіць у аптычную сістэму. Лікавая А. вызначаецца як $n \sin(\alpha/2)$, дзе $n$ — паказчык пераламлення асяроддзя, у якім знаходзіцца прадмет.

**АПЕРЦЭ́ПЦЫЯ** (ад лац. ad да + percеptio успрыманне), залежнасць успрымання ад мінулага вопыту, псіхічнага стану і індывідуальных асаблівасцяў чалавека. Тэрмін уведзены ням. філосафам Г.Лейбніцам, які трактаваў А. як выразнае (усвядомленае) успрыманне душой пэўнага зместу. І.Кант разам з «эмпірычнай» А. увёў паняцце «трансцэндэнтальнай» А., якая дазваляе сінтэзаваць шматлікія ўспрыманні на аснове спрадвечнага, нязменнага «адзінства свядомасці» як умовы ўсялякага вопыту і пазнання. У заснаванай В.Вунтам псіхалогіі А. (канец 19 — пач. 20 ст.) — успрыманне, якое патрабуе напружання волі і ад якога залежаць усе формы псіхічнай дзейнасці чалавека. Сучасная псіхалогія трактуе А. як вынік жыццёвага вопыту індывіда, які адлюстроўваецца ў кожным псіхічным працэсе (ад прасцейшага ўспрымання да найскладанейшых відаў дзейнасці). Адрозніваюць устойлівую А. — залежнасць успрымання ад асаблівасцяў асобы (светапогляду, перакананняў, адукаванасці і інш.) і часовую А., у якой звязваюцца сітуацыйна розныя формы псіхічнага стану (эмоцыі, установкі і г.д.).

*Літ.*: Лейбниц Г.В. Новые опыты о человеческом разуме. М.; Л., 1936; Вундт В. Очерки психологии. М., 1912; Гримак Л.П. Резервы человеческой психики. 2 изд. М., 1989.

**АПЕРЫТЫ́Ў** (франц. apéritif), спіртны напітак, прызначаны для ўзбуджэння апетыту. Ужываецца перад ежай. Як А. выкарыстоўваюць звычайна вермут, херас, моцныя спіртныя напіткі, разбаўленыя фруктовым сокам, тонікам, мінер. водою і інш.

**АПЕРЫЯДЫ́ЧНЫ ПРАЦЭ́С**, працэс пераходу дынамічнай сістэмы ў стан устойлівай раўнавагі, пры якім выхадная велічыня, што характарызуе такі пераход, набліжаецца да ўстойлівага значэння (крывая 1) або мае адзін экстрэмум (крывая 2). Напр., да А.п. набліжаюцца ваганні вагальнай сістэмы пры павелічэнні страт энергіі ў іх да крытычнага значэння (у эл. вагальнага контура крытычнае супраціўленне $R = \sqrt{L/C}$, дзе L і C — індуктыўнасць і ёмістасць контура адпаведна).



Вуглавая апертура ($\alpha$) аптычнай сістэмы.



Графікі аперыядычных працэсаў.

**АПЕРЭ́ТА** (італьян. operetta літар. маленькая опера), адзін з відаў муз. тэатра, у якім спалучаюцца вакальная і інструментальная музыка, танец, балет, элементы эстраднага мастацтва; твор для гэтага тэатра.

У 17 — 1-й пал. 19 ст. — невял., звычайна камічная *опера* з размоўнымі дыялогамі. На Беларусі гэта былі «Апалон-заканадаўца, або Рэфармаваны Парнас» Р.Вардоцкага на лібр. М.Цяцерскага (паст. 1789) і «Агатка, або Прыезд пана» Я.Д.Голанда на лібр. М.Радзівіла (паст. 1784), якія вызначаліся дэмакр. характарам, адлюстроўвалі перадавыя ідэі свайго часу. У сярэдзіне 19 ст. тэрмінам «А.» часта вызначаў свае п'есы В.І.Дунін-Марцінкевіч, задумваючы іх як лібрэта невял. опер. У супрацоўніцтве з ім С.Манюшка стварыў свае А. «Рэкруцкі набор» (1841), «Спаборніцтва музыкаў», «Чарадзейная вада», «Ідылія» (1852). У 1861 паст. А. «Канкурэнты» Ф.Міладоўскага (лібр. М.Лапіцкага і У.Сыракомлі).

Сучасная А. — від тэатра, які займае прамежкавае становішча паміж операй і *драмай*. Аснову муз. драматургіі складаюць звычайна куплетная песня і танец, а таксама традыц. оперныя формы (*арыя, ансамбль, хор, уверцюра*), якія часцей маюць песенна-танц. характар і больш простыя, чым у оперы. У адрозненне ад *вадэвіля* і інш. відаў муз. камедыі з развітым драм. тэкстам, музыка ў А. нясе асн. сэнсавую нагрузку.

Як самаст. від муз. тэатра А. сфарміравалася ў 1850-я г. ў Францыі. Яе вытокі — камічная опера, франц. вадэвіль, аўстрыйскія і ням. зінгшпілі і інш. Вылучаюць некалькі нац.-гіст. разнавіднасцяў А. з устойлівымі жанрава-стылявымі прыкметамі: парыжская (1850—70-я г., заснавальнік — Ж.Афенбах; Ф.Эрвэ, Ш.Лекок, Р.Планкет), венская (Ф.Зупэ, К.Мілёкер, І.Штраус-сын, К.Цэлер), неавенская (1900—1920-я г., Ф.Легар, І.Кальман). У пач. 1920-х г. у ЗША зацвердзіўся новы від муз. т-ра — *мюзікл*, які ў некат. сваіх разнавіднасцях набліжаецца да А. (творы Ф.Лоу, Дж.Гершвіна, Р.Роджэрса, Л.Бернстайна і інш.). У Расіі пачатак А. пакладзены ў 1920-я г. І.Дунаеўскім і М.Стрэльнікавым, сярод майстроў Ю.Мілюцін, Б.Аляксандраў, К.Лістоў, В.Салаўёў-Сядой, А.Фельцман, В.Баснер і інш.

На Беларусі з 1-й пал. 20 ст. развівалiся блізкія да А. формы муз.-камедыйнага тэатра («Каваль-ваявода» Е.Міровіча з муз. У.Тэраўскага і Л.Маркевіча, 1925; «Простыя сэрцы» С.Заяіцкага, С.Розанава і М.Міцкевіча з муз. В.Сакалова-Фядотава, 1929; «Кок-сагыз» М.Чуркіна, 1939; «Цудоўная дудка» В.Вольскага з муз. М.Шчаглова, 1939), а таксама «Кухня святасці» («Мільён Антоніяў») Я.Цікоцкага (1931) і «Зарэч-

Да арт. Аперэта. Сцэна са спектакля «Паўлінка» Ю.Семянякі. Дзярж. тэатра муз. камедыі Беларусі. 1973.

ны барок» С.Палонскага і М.Іванова (1940), якія вызначаліся сучаснікамі як «першыя сав. аперэты». У 1970-я г. з'явіліся творы, найб. адпаведныя жанру А.: «Паўлінка» Ю.Семянякі са шматпланавай муз. драматургіяй, скразнымі муз. тэмамі, разгорнутымі сольнымі нумарамі, ансамблямі, харамі і «Несцерка» Р.Суруса, якія дзякуючы зместу, народнасці муз. мовы і ўдалым масавым сцэнам сталі сапраўднымі А. буйной формы. Шэраг бел. твораў, блізкіх да жанру А., класіфікуюць як «гераічная муз. камедыя» («Дзяніс Давыдаў» А.Мдывані, 1985), «муз. камедыя» («Мільянерка» Я.Глебава, 1987), мюзікл («Джулія», 1991, і «Шклянка вады», 1994, У.Кандрусевіча).

Сярод артыстаў А.: Г.Шнайдэр (Францыя), А.Жырардзі (Аўстрыя), Г.Марышка і Х.Хонці (Венгрыя), Р.Ярон, Т.Шмыга (Расія), М.Вадзяной (Украіна); у бел. т-ры Н.Гайда, В.Мазур, Р.Харык, А.Ранцанц, З.Вяржбіцкая, Г.Казлоў і інш.

*Літ.*: Владимирская А. Звездные часы оперетты. 2 изд. Л., 1991; Траубергъ Л. Жак Оффенбах и другие. М., 1987; Музычны тэатр Беларусі, 1917—1959. Мн., 1993.

*Б.С.Смольскі, Н.А.Юўчанка.*

**АПЕТЫ́Т** (ад лац. appetitus жаданне), эмацыянальнае выяўленне і адчуванне патрэбы чалавека ў ежы ўвогуле або ў асобных яе відах. У адрозненне ад пачуцця *голаду* звязаны з прыемнымі эмоцыямі і ўяўленнямі. Адбітак на яго (стымулявальны ўплыў або прыгнечанне) могуць накладваць нац. традыцыі, індывід. прывычкі і прыхільнасці, выгляд, пах, кампаненты, смакавыя якасці і спосабы падачы ежы. Фізіял. аснову А. складае ўмеранае ўзбуджэнне пэўных аддзелаў ц.н.с., што суправаджаецца слінацячэннем, выдзяленнем «запаляльнага» стрававальнага соку, узмацненнем перыстальтыкі стрававальнакішачнага тракту. У аснове расстройстваў А. могуць ляжаць парушэнні рэжыму і ўмоў харчавання, рэзкія змены яго звыклага рацыёну, а таксама ўкладу жыцця, фіз. і нерв. ператамленне, захворванні і інш. фактары. У асобных выпадках яны могуць выклікаць поўную адсутнасць А. (анарэксія) ці неадольнае жаданне есці (булімія), што сведчыць пра неабходнасць мед. абследавання.

**АПЁК**, пашкоджанне тканак арганізма, якое выклікаецца высокай т-рай (тэрмічны А.), хім. сродкамі (хімічны А.), электрычным токам (электрычны А.), сонечнымі і рэнтгенаўскімі прамянямі (сонечны і радыяцыйны А.). У чалавека і жывёл адрозніваюць 4 ступені А.: 1-я — пачырваненне скуры, *ацёк*; 2-я — узнікненне пухіроў; 3-я — амярцвенне скуры на ўсю таўшчыню; 4-я — амярцвенне падскурнай тлушчавай клятчаткі, мышцаў і касцей (абвугліванне). Лячэнне залежыць ад памераў апечанай паверхні, агульнага стану арганізма і г.д., уключае барацьбу з шокам, хірург. апрацоўку апечаных месцаў, тэрапеўтычныя метады. У раслін бываюць А. кары (напр., сонечны А. пладовых дрэў), ліслця і пладоў пры няправільным карыстанні ядахімікатамі, пашкоджанні грыбковымі і бактэрыяльнымі хваробамі.

**А́ПІЕВА ДАРО́ГА** (лац. via Appia), першая брукаваная дарога (працягласць каля 350 км), пракладзеная ў 312 да н.э. паміж Рымам і Капуяй. Пабудавана ў стратэг. мэтах пры цэнзару Апію Клаўдзію (адсюль назва), у 244 да н.э. прадоўжана да Брундызія. Вымашчана квадратнымі камянямі, уздоўж дарогі (каля Рыма) захаваліся помнікі стараж. некропаля язычніцкіх і раннехрысц. часоў.

**А́ПІС**, у егіпецкай міфалогіі бог урадлівасці. Цэнтр культу А. — г. Мемфіс, дзе ён лічыўся душой бога Мемфіса Птаха і бога сонца *Ра*. Жывым увасабленнем А. быў чорны бык з белымі меткамі на лбе, якога трымалі ў асобным памяшканні, памерлага бальзаміравалі і хавалі ў спец. склепе Серапеўме.

Апіс. Бронза. 7 ст. да н.э.

**АПІСТАРХІ́ДЫ** (Opisthorchiadae), сямейства гельмінтаў класа смактуноў; паразіты рыб, паўзуноў, птушак, млекакормячых і чалавека. У сусв. фауне 29 родаў, больш за 100 відаў. На Беларусі 4 віды. Найб. пашыраны апістарх кашэчы (Opistorchis felineus) — узбуджальнік *апістархозу*.

Даўж. каля 1 см. Развіваюцца ў прамежкавых (малюскі), дадатковых (карпавыя рыбы) і канчатковых гаспадароў (рыбаедныя жывёлы і чалавек).

**АПІСТАРХО́З**, гельмінтозная прыроднаачаговая хвароба жывёл і чалавека; выклікаецца трэматодай апістархам кашэчым з сям. *апістархідаў*. Пашыраны ў Еўропе і Азіі. Ачагі А. на Беларусі пераважна ў бас. рэк Дняпро, Прыпяць, Нёман, Зах. Буг, Браслаўскіх азёраў. Характарызуецца пашкоджаннем печані, жоўцевага пузыра, падстраўнікавай залозы, алергічнымі рэакцыямі. Заражэнне адбываецца пры спажыванні сырой, недастаткова праваранай і праселенай рыбы. Развіццё ўзбуджальніка адбываецца з удзелам прамежкавага (малюск бітынія) і дадатковага (рыба) гаспадароў. Лячэнне тэрапеўтычнае.

**АПІ́ТА**, рака ў Беларусі, у Іўеўскім р-не Гродзенскай вобл., правы прыток Гаўі (бас. Нёмана). Даўж. 23 км. Ад вытоку на працягу 5 км каналізаваная. На рацэ каля вёсак Кузьмічы і Ліпнішкі сажалкі.



Да арт. Апістархіды. Апістарх кашэчы (павялічаны).

**А́ПІЯ** (Apia), горад, сталіца Заходняга Самоа, на паўн. беразе в-ва Уполу. 42 тыс. ж. (1992). Порт на Ціхім ак. Экспарт копры, бананаў, какава-зярнят. Міжнар. аэрапорт. Ун-т.

**АПІ́ЯН** (Appianos; каля 100, Александрыя — каля 170 н.э.), гісторык Стараж. Рыма. Грэк па паходжанні. Пры *Адрыяне* рым. грамадзянін, адвакат фіску ў Рыме, пазней — імператарскі пракуратар у Егіпце. Напісаў на грэч. мове «Гісторыю Рыма» ў 24 кнігах (ад заснавання горада да пач. 2 ст.), дзе праслаўляў магутнасць Рым. дзяржавы і

даказваў справядлівасць захопу ёю чужых тэрыторый. Унутр. гісторыю Рыма паказваў праз вял. войны, праз гісторыю асобных абласцей. Захаваліся 6—9-я і 11—17-я кнігі, 18—24-я невядомыя, інш. дайшлі ў фрагментах.

*Тв.*: Рус. пер. — Гражданские войны. Л., 1935.

**АПІЯСАМО́З**, глосаталёз, інвазійная хвароба моладзі рыб, якую выклікаюць умоўна-патагенныя інфузорыі з роду Apiosoma. Узбуджальнік — часцей A. piscicola, пашыраная ў штучных сажалках, у т.л. і на Беларусі. Інфузорыі выклікаюць на скуры і шчэлепах моладзі рыб некрозы і моцнае слізевыдзяленне. Шчэлепы бледныя. У зімавальных сажалках хворая моладзь худнее і гіне. Хвароба ўскладняецца паразітаваннем інш. інфузорый. Лечаць брыльянтавай зеленню. Прафілактыка: стварэнне нармальных гідрахім. умоў і падтрыманне чысціні вадаёмаў.

**АПЛАДНЕ́ННЕ**, сінгамія, працэс зліцця мужчынскай і жаночай палавых клетак (гамет); аснова палавога размнажэння ў раслін, жывёл і чалавека. У выніку А. ўтвараецца *зігота*, якая дае пачатак новаму арганізму. Пры гэтым аднаўляецца дыплоідны набор храмасом, характэрны для саматычных клетак арганізма, і забяспечваецца перадача спадчынных прыкмет ад бацькоў да нашчадкаў.

Адрозніваюць А. вонкавае, калі палавыя клеткі зліваюцца па-за арганізмам, і ўнутранае, якое адбываецца ўнутры палавых органаў індывіда (перакрыжаванае А. і самаапладненне). У жывёл і чалавека А. папярэднічае *асемяненне*. У жывёл з унутраным А. (пераважна наземныя жывёлы) ёсць спец. прыдаткавыя палавыя органы для пераносу спермы з цела самцоў у цела самак. У большасці жывёл, што жывуць у вадзе (ігласкурыя, малюскі, некаторыя рыбы і земнаводныя), назіраецца вонкавае А.: у навакольным асяроддзі адкладаюцца яйцаклеткі і сперма, дзе і зліваюцца. У шэрагу раслін (бактэрыі, сіне-зялёныя водарасці) тыповы палавы працэс, у т.л. А., адсутнічае. У ніжэйшых раслін назіраюцца розныя віды палавога працэсу: *ізагамія, анізагамія, аагамія, кан'югацыя* і інш. Вышэйшым раслінам уласціва аагамія. У голанасенных і пакрытанасенных раслін А. папярэднічае *апыленне*. У пакрытанасенных ажыццяўляецца т.зв. *двайное апладненне*.

**АПЛАЗІ́Я**, гл. ў арт. *Заганы развіцця*.

**АПЛА́ТА ПРА́ЦЫ**, узнагароджанне ў грашовай ці натуральнай форме, якое выплачваецца работніку за працу, выкананую ў справаздачны перыяд. Уключае: *заработную плату*; выплаты і дапамогі з фондаў сац. страхавання (пенсіённая, занятасці, сац. абароны насельніцтва і інш.); сац. дапамогі, што выплачваюцца непасрэдна прадпрыемствамі і арг-цыямі (даплаты да пенсій, выплаты ў сувязі з вытв. траўмай ці гібеллю на вытв-сці); дапамогі па беспрацоўі; пенсіі ваеннаслужачым. Узровень А.п. вызначаецца па суме ўсіх гэтых налічэнняў без выліку падаткаў і інш. утрыманняў у адпаведнасці з заканадаўствам.

**АПЛІКАТУ́РА**, спосаб размяшчэння і парадак чаргавання пальцаў пры ігры на муз. інструменце, а таксама яго абазначэнне ў нотах. Залежыць ад спецыфікі канструкцыі інструмента і прыёмаў ігры на ім, ад індывід. асаблівасцяў будовы рук выканаўцы. Зручная А. — дзейсны сродак выразнасці выканання твора. *І.Дз.Назіна.*

**АПЛІКА́ЦЫЯ** (ад лац. applicatio прыкладванне), у мастацтве спосаб стварэння дэкору (арнаменту, малюнкаў) і тэатр. дэкарацый, аздаблення адзення, прадметаў побыту і інш. нашываннем ці наклейваннем рознакаляровых кавалачкаў матэрыялаў (тканіны, паперы, саломы, скуры) інш. колеру ці фактуры; твор, выкананы такім спосабам. Пашырана ў многіх народаў свету: украінцаў, чэхаў (А. саф'янам і

Да арт. Апістархоз. Цыкл развіцця апістарха кашэчага.

сукном скураной вопраткі), палякаў (А. папяровых *выцінанак*), манголаў (А.сукном, лямцам і скураю юртаў, дываноў, сумак), народаў Д. Усходу (А. футрам і рыбінай скурай дываноў і адзення) і інш. Здаўна вядомая на Беларусі. А. аздаблялі побытавыя рэчы, адзенне; аднатоннымі ці паліхромнымі кавалачкамі саломы, наклеенымі ў выглядзе геам. і стылізаваных раслінных узораў, упрыгожвалі драўляныя куфэркі, сальніцы, рамкі; А. саломкай па чорным палатне аздаблялі насценныя дываны. З канца 19 ст. А. з кавалачкаў фабрычных тканін аздаблялі адзенне (Брэстчына), часам канцы ручнікоў (Случчына). У наш час у тэхніцы А. саломай аздабляюць сувенірныя куфэркі, каробкі, пано і інш.

У літаратуры А. — уплятанне ў вершаваны тэкст вядомага выслоўя (прымаўкі, радка з песні, верша і інш.). На выкарыстанні нар. прымавак заснаваны верш П.Панчанкі «Простыя ісціны», радкоў з нар. песні «Дробненькі дожджык дый накрапае» — аднайменны верш Р.Барадуліна. Своеасаблівы від А. — уключэнне ў вершаваны тэкст назваў твораў або кніг вядомага пісьменніка, мастака: «То не плач яго **Бандароўны**, // А зажынкавы спеў ля гаю, // Што калісьці было **безназоўным**, // і імя і **спадчыну** мае» (С.Ліхадзіеўскі. «Светлай памяці Янкі Купалы»). *Я.М.Сахута* (мастацтва), *В.П.Рагойша* (літаратура).

**АПЛІ́Т** (ад грэч. haploos просты), жыльная магматычная горная парода. Раўнамерна- і дробназярністая, бедная слюдой і інш. каляровымі мінераламі. Адрозніваюць гранітныя (найб. пашыраныя), дыярытавыя, сіенітавыя і інш. Шчыльн. 2500—2700 кг/м$^3$. Сярэдні хім. састаў (% па масе) гранітных А.: $SiO_2$ 75, $Al_2O_3$ 13,4, $K_2O$ 4,8, $Na_2O$ 3,54, CaO 1,13 і інш. Выкарыстоўваецца ў шкляной прам-сці, як сыравіна на друз.

**АПЛО́МБ** (франц. aplomb літар. раўнавага) у харэаграфіі, упэўненая, свабодная манера выканання; уменне захоўваць у раўнавазе ўсе часткі цела. Тэрмін «А.» ідзе ад прыёмаў віртуознай тэхнікі танца 18 ст. — «рабіць А.» значыла заставацца ў раўнавазе на пальцах некалькі тактаў; у 1-й трэці 19 ст. — устойлівасць на кончыках пальцаў.

**АПЛЫ́ВІНА**, ссоўванне (аплыванне) уніз па схіле слоя глебы або рыхлых парод ад пераўвільгатнення. Паходжаннем А. блізкія да *апоўзняў*, толькі меншых памераў (шыр. да некалькіх метраў; глыб. да 1 м). Фарміруюцца ва ўмовах празмернага ўвільгатнення пры насычэнні глебаў і грунтоў талымі, дажджавымі або грунтавымі водамі да газепадобнага стану. Трапляюцца ў раёнах шматгадовай мерзлаты, на незадзернаваных насыпах. У Беларусі пашыраны на лёсападобных пародах схілаў Мінскага, Навагрудскага і Аршанскага ўзвышшаў.

**АПНО́Э** (ад *a*... + грэч. pnoē дыханне), часовае спыненне дыхальных рухаў у чалавека і жывёл. Настае пасля фарсіраванага дыхання пры недахопе ў крыві вуглякіслага газу, моцнага павышэння артэрыяльнага крывянога ціску або раздражненнямі скуры (напр., халоднай вадой), у нованароджаных — адразу пасля нараджэння ад лішку кісларoду ў крыві. Адрозніваецца ад *асфіксіі*, якая ўзнікае пры кіслародным галаданні і лішку вуглякіслага газу.

**АПО́ВЕСЦЬ**, празаічны (часам вершаваны) твор; жанр эпічнай л-ры (гл. *Эпас*), пераходны паміж *апавяданнем* і *раманам*. Ад апавядання адрозніваецца больш шырокім ахопам рэчаіснасці, больш складаным сюжэтам, шматгранным раскрыццём характараў. У цэнтры класічнай А., як правіла, адна сюжэтная лінія, адзін герой. Сучасная А. ахопам і канцэнтрацыяй жыццёвага ма-

тэрыялу, па многіх фармальных рысах набліжаецца да рамана.

Як назва жанру л-ры бытуе з часоў Кіеўскай Русі. Тады А. называлі самыя розныя па форме творы гіст., ваен. і рэліг. зместу (гл. *Аповесць старажытнаруская*), часта яна мела форму хронікі ці летапісу. З твораў стараж. бел. л-ры да жанру тагачаснай А. можна аднесці «Дыярыуш» А.Філіповіча (1646), *Баркулабаўскі летапіс*, перакладныя творы — *«Аповесць пра Трышчана»*, *«Аповесць пра Баву»*, *«Трою»*, *«Александрыю»*.

У сучасным разуменні А. пачала складвацца ў рус. л-ры ў 19 ст. Тыповая, «чыстая» форма А. — гэта пераважна твор біягр. характару, маст. хронікі: дылогія С.Аксакава, «Запіскі з Мёртвага дому» Ф.Дастаеўскага, «Стэп» А.Чэхава, трылогіі Л.Талстога, М.Горкага і інш.

Пачынальнікі сучаснай бел. А. (і рамана) — Ц.Гартны («Бацькава воля», 1-я ч. «Сокаў цаліны», 1916), М.Гарэцкі (драматызаваная А. «Антон», 1919; дакумент. А. «На імперыялістычнай вайне», 1926), Я.Колас («У палескай глушы», 1921—22). Пра сталасць жанру А. ў бел. л-ры сведчыць ахоп самых розных аспектаў жыцця, філас. асэнсаванне гісторыі і сучаснасці, пільная ўвага да чалавека, маст. вытлумачэнне яго псіхалогіі рэальнай складанасцю ўзаемаадносін характару і абставін, асобы і грамадства: «Апошняя сустрэча» Я.Брыля, «Агонь і снег», «Гандлярка і паэт» І.Шамякіна, «Тартак», «Найдорф» І.Пташнікава, «Сотнікаў», «Абеліск», «Знак бяды», «Сцюжа» В.Быкава, «Хатынская аповесць», «Карнікі» А.Адамовіча, «Суд у Слабадзе» В.Казько, «Зона маўчання» С.Грахоўскага, «Пад сузор'ем сярпа і молата» Б.Сачанкі, «Сны імператара» У.Арлова і інш.

*Літ.*: Беларуская савецкая проза: Раман і аповесць. Мн., 1971. *П.К.Дзюбайла.*

**«АПО́ВЕСЦЬ МІНУ́ЛЫХ ГАДО́Ў»**, «Повесть временных лет», помнік усх.-слав. летапісання, першы агульнарус. летапісны звод. Складзены на пач. 12 ст., відаць, манахам Кіева-Пячэрскага манастыра *Нестарам* на аснове больш ранніх крыніц. Зберагліся ў розных летапісных зводах (*Лаўрэнцьеўскі летапіс*, *Іпацьеўскі летапіс*, *Радзівілаўскі летапіс* і інш.), у скарочанай рэдакцыі — у шматлікіх гіст. зборніках і хранаграфічных кампіляцыях. Асн. змест твора — паліт. гісторыя ўсх. славян, Кіеўскай дзяржавы, пададзеная на шырокім міжнар. фоне ў сувязі з гісторыяй суседніх краін і народаў. Ва ўступнай, недатаванай частцы, напісанай у форме гіст. аповесці пра далёкае мінулае Расіі, гаворыцца пра паходжанне славян, рассяленне ўсх.-слав. плямёнаў, іх норавы і звычаі, пра ўзнікненне Кіева, першых кіеўскіх князёў. На аснове фальклорнай традыцыі апісваюцца падзеі 9—10 ст. (у т.л. паданне пра запрашэнне варагаў на Русь, якое лягло ў аснову т.зв. *нарманскай тэорыі*), намаляваны вобразы стараж.-рус. князёў Алега, Ігара, Святаслава, княгіні Вольгі. У датаванай частцы летапісу храналагічна ў пагадовай форме выкладзена гісторыя Русі ад першай звесткі, пазначанай 852, і да 1110 уключна, адлюстравана эпоха барацьбы ўсх. славян за сваю свабоду і незалежнасць. Значнае месца займаюць звесткі па гісторыі рус. царквы, пра хрышчэнне Русі. Крыніцамі для зводу паслужылі папярэднія кіеўскія і візант. летапісы, хронікі, жыціі і дакумент. матэрыялы, Біблія. Складальнік летапісу быў аўтарам шырокага кругагляду і вял. пісьменніцкага таленту. Багатая па змесце і арыгінальная па форме «А.м.г.» — каштоўная крыніца пазнання жыцця продкаў рус., бел. і ўкр. народаў. Летапіс змяшчае унікальныя звесткі з гісторыі бел. зямель, асабліва *Полацкага княства*. Толькі ў «Аповесці...» расказваецца пра полацкага кн. 10 ст. Рагвалода і яго дачку Рагнеду. Выкладзена падрабязная гісторыя жыцця і дзейнасці кн. Усяслава Брачыславіча. У летапісе прыведзены самыя раннія звесткі пра Полацк, Віцебск, Мінск, Тураў, Пінск, Бярэсце, Друцк і інш. бел. гарады. У скарочаным выглядзе (запісы пра падзеі 854—1074) «А.м.г.» увайшла ў *Беларуска-літоўскі летапіс 1446*.

*Літ.*: Шахматов А.А. Разыскания о древнейших русских летописных сводах. Спб., 1908; Яго ж. Повесть временных лет. Т. 1. Пг., 1916; Лихачев Д.С. Русские летописи и их культурно-историческое значение. М.; Л., 1947. *В.А.Чамярыцкі.*

**«АПО́ВЕСЦЬ ПРА АТЫ́ЛУ — КАРАЛЯ́ УГО́РСКАГА»**, гл. *«Гісторыя пра Атылу»*.

**«АПО́ВЕСЦЬ ПРА БАВУ́»**, помнік бел. перакладной л-ры, сярэдневяковы рыцарскі раман. Узнік у Францыі. Бел. пераклад зроблены ў 2-й пал. 16 ст. з сербскага тэксту і паслужыў крыніцай шэрагу рус. спісаў. Збярогся ў т. зв. Пазнанскім зборніку. Мае займальны любоўна-авантурны сюжэт. Асн. змест — незвычайныя прыгоды сына цара Гвідона і царыцы Міліграсы (у бел. рэд. — Мератрысы) у яго змаганні за бацькаўскую спадчыну і царэўну Дружнену. У імя кахання Бава праходзіць выпрабаванні, здзяйсняе волатаўскія подзвігі, пасля шчасліва вяртаецца на радзіму і карае смерцю падступную маці і яе палюбоўніка Дадона, забойцаў свайго бацькі. «А. пра Б.» нагадвае твор нар. гераічнага эпасу, у якім выкарыс-

Да арт. Аплікацыя. Пано «Птушка». 1973.

Да арт. Аплікацыя. Дываны. Аплікацыя па тканіне. Вёска Рухава Старадарожскага раёна Мінскай вобл. 1980.

Да арт. Аплікацыя. Куфэркі. 1990-я г.

таны прыёмы гіпербалізацыі: Бава валодае надзвычайнай сілаю, героем выступае напаўчалавек-напаўсабака Палкан і інш. Драматычна напружаны сюжэт, багацце казачнага элемента спрыялі папулярнасці рамана, які бытаваў ва ўсх. славян да 20 ст., пранік у фальклор, стаўшы нар. казкаю. *В.А.Чамярыцкі.*

**«АПО́ВЕСЦЬ ПРА ВАРЛААМА І ІАСА́ФА»**, гл. *«Гісторыя пра Варлаама і Іасафа»*.

**«АПО́ВЕСЦЬ ПРА ЖЫГІМО́НТА І БАРБА́РУ РАДЗІВІ́Л»**, гісторыка-літаратурны твор, складзены ў сярэдзіне 16 ст., напэўна, у Вільні і змешчаны ў канцы *«Хронікі Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага»* пад 1545—48 (Пазнанскі спіс). У аповесці апісана гісторыя кахання і шлюбу вял. князя ВКЛ і караля Польшчы Жыгімонта II Аўгуста і прыгажуні Барбары Радзівіл, якія, ідучы насустрач сваім пачуццям, патаемна павянчаліся ў Вільні. Невядомы аўтар з сатырычным адценнем намаляваў усеагульнае грамадскае асуджэнне ў ВКЛ і Польшчы шлюбу караля з жанчынай-удавою некаралеўскага роду. Аднак каханне перамагло, Жыгімонт Аўгуст не адмовіўся ад Барбары і застаўся верны сваёй абранніцы.



«Аповесць пра Трышчана» (фрагмент). 16 ст.

**«АПО́ВЕСЦЬ ПРА МЕРКУ́РЫЯ СМАЛЁНСКАГА»**, гл. *«Слова пра Меркурыя Смаленскага»*.

**«АПО́ВЕСЦЬ ПРА ПАДО́ЛЛЕ»**, помнік бел.-літ. летапісання 1-й пал. 15 ст. Узнікла каля 1432—35, найб. верагодна, у Вільні ў асяроддзі пануючых колаў ВКЛ. Змешчана ў *Беларуска-літоўскім летапісе 1446* у канцы *«Летапісца вялікіх князёў літоўскіх»*; у 16 ст. ўключана ў *«Хроніку Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага»* і *Хроніку Быхаўца*. Асн. змест — гісторыя Падольскай зямлі 2-й пал. 14 — 1-й трэці 15 ст. і яе далучэння да ВКЛ. Створана як паліт. дакумент з мэтаю абгрунтаваць гіст. правы ВКЛ на Падолле і асудзіць палітыку польск. феадалаў, якія пасля смерці Вітаўта захапілі Зах. Падолле. Падзеі і факты, выкладзеныя ў творы, у асноўным адпавядаюць гіст. сапраўднасці. Напісана на старабел. мове дзелавым стылем без пазнаванне дат, вылучаецца публіцыстычнасцю, свецкім характарам зместу.

*В.А.Чамярыцкі.*

**«АПО́ВЕСЦЬ ПРА СКАНДЭРБЕ́ГА»**, помнік бел. перакладной л-ры пач. 17 ст. Матэрыялам для аповесці паслужыла нац.-вызв. барацьба алб. народа пад кіраўніцтвам Г.Кастрыёці, празванага Скандэрбегам, супраць тур. нашэсця ў 15 ст. Бел. пераклад зроблены з раздз. «Пра Скандэрбега Македона, албанскага князя» працы польск. гісторыка М.Бельскага «Хроніка ўсяго свету» (1551). У параўнанні з польск. крыніцай аповесць дэмакратызавана: Скандэрбег у барацьбе з туркамі апіраецца не на феадалаў, а на народ, гуманна ставіцца да мірнага тур. насельніцтва. У творы падкрэслена агульнаеўрап. значэнне барацьбы Скандэрбега.

*Публ.:* Повесть о Скандербеге. М.; Л., 1957.

**«АПО́ВЕСЦЬ ПРА ТАЎДА́ЛА»**, «Книга о Таудале-рыцеры», помнік бел. перакладной л-ры 16 ст., твор царк.-рэліг. характару. Арыгінал аповесці ўзнік у 12 ст. на лац. мове ў Ірландыі. Бел. пераклад з чэшскай крыніцы. У аповесці выкарыстаны папулярны матыў тагачаснай л-ры — дзівоснае перавыхаванне героя-грэшніка. У аснове сюжэта незвычайнае падарожжа па замагільным свеце душы рыцара Таўдала, які ад моцнага перапою часова страціў прытомнасць. Уражаны страшнымі пакутамі грэшнікаў у пекле, герой каецца ў грахах і вырашае жыць праведна, па хрысц. запаветах. Твор цікавы як сведчанне духоўных запатрабаванняў таго кола бел. чытачоў эпохі Адраджэння, у асяроддзі якіх былі яшчэ жывыя сярэдневяковыя ўяўленні і густы.

*В.А.Чамярыцкі.*

**«АПО́ВЕСЦЬ ПРА ТРОХ КАРАЛЁЎ»**, помнік бел. перакладной л-ры апакрыфічнага характару. Арыгінал напісаны ў 14 ст. ням. манахам Іаганам з Гільдэсгейма на лац. мове. На бел. мову перакладзены ў 2-й пал. 15 ст. У аснове аповесці евангельскі эпізод пра пакланенне немаўляці Ісусу Хрысту трох усх. цароў-язычнікаў, якія пасля сталі шчырымі хрысціянамі. У творы апісваецца іх незвычайнае падарожжа ў «святую зямлю», прырода зямель Б. Усходу, побыт, звычаі, веравызнаўчыя і этнічныя асаблівасці розных народаў, у т.л. грэкаў, сірыйцаў, армянаў, грузінаў. У аповесці многа фантастычнага, авантурна-прыгодніцкага. Яна каштоўная як сведчанне духоўных запатрабаванняў пэўных слаёў бел. чытачоў 15—16 ст., адна з крыніц іх уяўленняў пра краіны Б.Усходу. Пераклад даволі прафесійны, мова без царкоўнаславянізмаў.

*В.А.Чамярыцкі.*

**«АПО́ВЕСЦЬ ПРА ТРО́Ю»**, гл. *«Троя»*.

**«АПО́ВЕСЦЬ ПРА ТРЫШЧА́НА»**, помнік бел. перакладной л-ры. Папулярны рыцарскі раман. Перакладзены на бел. мову ў 2-й пал. 16 ст. з сербскай крыніцы (апошняя з італьян. арыгінала). Бел. пераклад збярогся ў Пазнанскім рукапісным зборніку. У аснове твора — паэт. кельцкая легенда пра ўзнёслае каханне рыцара Трыстана і каралевы Ізольды (у бел. рэдакцыі — Трышчана і Ежоты), што ў шматлікіх літ. апрацоўках на працягу стагоддзяў бытавала сярод народаў Еўропы. «А. пра Т.» — класічны ўзор жанру рыцарскага рамана, пабудаванага на авантурна-прыгодніцкай фабуле і любоўнай інтрызе. Гал. герой — ідэальны рыцар, які служыць прыгожай даме і праводзіць свой час у няспынных прыгодах і рыцарскіх турнірах. У барацьбе за прыгожую Ежоту, дачку ірландскага караля, якую герой здабывае ў паядынках з рознымі сапернікамі свайму дзядзьку, каралю Марку, Трышчан выходзіць пераможцам. Аднаго ён не можа пераадолець — сваіх пачуццяў да Ежоты. Каханне прыносіць героям вял. пакуты: Ежота належыць каралю Марку, сеньёру Трышчана, і становіцца яго жонкай. У зах.-еўрап. версіях легенды зроблена спроба знайсці выйсце: гал. герой жэніцца на другой Ізольдзе. Аднак такі ўчынак прыносіць новыя пакуты закаханым. Усёпаглынальная любоўная страсць паскарае заўчасную смерць гал. герояў. Фінал твора гучыць як гімн вял. каханню. У бел.-сербскай «А. пра Т.» падзеі заключнай часткі выкладзены інакш: Трыстан не жэніцца з другой жанчынаю, а застаецца верны сваёй каханай да канца, дзеянне ў творы не даведзена да трагічнага фіналу. У бел. апрацоўцы асн. ўвага сканцэнтравана на апісанні незвычайных прыгод, паядынкаў і рыцарскага гераізму Трышчана; аптыміст. канец лепш стасуецца з агульнай ідэйна-маст. канцэпцыяй аповесці, у якой, насуперак аскетычным прынцыпам хрысціянства, апяваюцца пачуцці і перажыванні чалавека, яго зямныя радасці і страсці, паэтызуецца пераможная сіла кахання. «А. пра

Т.» — унікальны слав. варыянт літаратурнай апрацоўкі славутай легенды, каштоўны помнік бел. літ. мовы 16 ст. Перакладзена на сербскахарвацкую (Бялград, 1966), англ. (Лідс, 1977; Нью-Йорк, 1988), італьян. (Фларэнцыя, 1983) мовы.

*Публ.*: Легенда о Тристане и Изольде. М., 1976. *В.А.Чамярыцкі.*

**АПО́ВЕСЦЬ СТАРАЖЫТНАРУ́СКАЯ**, жанр старажытнарускай л-ры, які аб'ядноўвае апавядальныя творы розных відаў (воінская, жыційная, бытавая, сатырычная аповесці, сказанне, гісторыя, слова, павучанне).

Вядома з 11 ст. Напачатку гэта былі перакладныя (пераважна з грэч.) творы — «Гісторыя Іудзейскай вайны» Іосіфа Флавія, прыгодніцка-фантастычная «Александрыя» пра Аляксандра Македонскага, гераічнае «Дзяўгеніева дзяянне», павучальныя *«Жыціе Аляксея, чалавека Божага»*, *«Гісторыя пра Варлаама і Іасафа»*, апакрыфічныя «Пра стварэнне Адама», *«Хаджэнне Багародзіцы па пакутах»*. Амаль адначасова ўзніклі і арыгінальныя, пераважна гістарычныя, аповесці. Для кожнай жанравай разнавіднасці існавала свая літ.-эстэтычная рэгламентацыя. У 11—13 ст. пераважаў стыль манум. гістарызму, якому ўласцівыя значнасць тэм і праблем (веліч радзімы, сэнс чалавечага жыцця), ахоп падзей у буйных гіст. маштабах і вял. прасторах. На пач. 12 ст. ўзніклі агіяграфічныя аповесці *«Сказанне аб Барысе і Глебе»*, *«Жыціе Ефрасінні Полацкай»* і інш. (гл. *Жыціе*). Асаблівую папулярнасць набылі *воінскія аповесці* пра гераічную барацьбу за незалежнасць роднай зямлі (*«Слова пра паход Ігараў»*). Блізкія да іх і царк. біяграфіі вядомых гіст. асоб («Аповесць пра жыццё Аляксандра Неўскага»). А.с. перыяду Кіеўскай Русі належыць да культурнай спадчыны рус., бел. і ўкр. народаў. У далейшым яна развівалася ў межах *рускай літаратуры*.

А.с. шырока бытавалі на Беларусі, а многія з іх у 15—17 ст. перакладаліся на бел. мову, перапрацоўваліся, уваходзілі ў буйныя творы інш. жанраў. Так, у 15—16 ст. з'явіліся бел. апрацоўка апокрыфа «Хаджэнне Багародзіцы па пакутах» — «Аб дванаццаці пакутах», бел. рэдакцыя «Сказання пра Мамаева пабоішча» — *«Мамаева пабоішча»*; «Аповесць пра разбурэнне Батыем Разані» была ўключана ў Беларуска-літоўскі летапіс 1446.

*Літ.*: История белорусской дооктябрьской литературы. Мн., 1977; История русской литературы X—XVII веков. М., 1980; Старинная русская повесть: Статьи и исслед. М.; Л., 1941. *Л.Л.Каротkая.*

**АПО́КА**, лёгкая, цвёрдая, танкапорыстая крамяністая асадкавая горная парода, складзеная з аморфнага крэменязёму (апалу да 98%) з прымесямі гліністых часцінак, шкілетных ч. арганізмаў (дыятамей, радыялярый і інш.) і пяску. Колер ад шэрагу розных адценняў да амаль чорнага. Трапляецца пераважна сярод мелавых і ніжнепалеагенавых адкладаў. Выкарыстоўваецца ў будаўніцтве (для цеплаізаляцыі). Чыстыя гатункі А. — моцныя адсарбенты.

**АПО́КА** ў ліцейнай вытворчасці, прыстасаванне ў выглядзе жорсткай рамы (адкрытай скрынкі), якое запаўняецца фармовачнай сумессю для атрымання *ліцейнай формы*. А. бываюць: прамавугольныя, круглыя і фасонныя; суцэльналітыя і зварныя; ручныя, кранавыя і камбінаваныя (з ручным і кранавым пад'ёмам). Вырабляюцца са сталі, чыгуну, алюмініевых і інш. сплаваў. З А. фармовачную сумесь выбіваюць на вібрацыйных машынах.

**АПО́КАЎ** Яўген Уладзіміравіч (1.2.1869, в. Шамраеўка Сквірскага р-на Кіеўскай вобл. — 1.9.1938), украінскі гідролаг, гідрагеолаг; адзін з заснавальнікаў гідралогіі. Акад. АН Украіны (1929). Правадз. чл. УАСГНІЛ (1935). Праф. (1917). Скончыў Пецярбургскі тэхнал. ін-т (1892). У канцы 19 — пач. 20 ст. працаваў на Беларусі ў складзе *Заходняй экспедыцыі па асушэнні балотаў Палесся*. З 1913 узначаліў работы па вывучэнні балотаў Палесся, інжынер-гідратэхнік Мінскай губ. Займаўся гідрагеал. вышуканнямі для водазабеспячэння Мінска. Выказаў меркаванне пра сувязь геал. структур Пд Беларусі з Дняпроўскай упадзінай на Украіне і інш. З 1926 дырэктар НДІ воднай гаспадаркі Украіны.



Апока ў ліцейнай вытворчасці: *а* — круглая; *б* — прамавугольная.

Аполак: *а* — гарбельны; *б* — дашчаны.

*Тв.*: Режим речного стока в бассейне Верхнего Днепра [до г. Киева]... Ч. 1—2. Спб., 1904—13; Режим грунтовых вод в районе Полесья. Спб., 1914; Праблема Вялікага Дняпра і асушэнне Палесся. Мн., 1935.

**АПО́КРЫФЫ** (ад грэч. apokryphos таемны, запаветны), мастацкія аповесці ў сярэдневяковых л-рах, сюжэтна звязаныя з *Бібліяй*, жыціямі святых, легендамі пра рай, пекла, канец свету. Забараняліся царквой як некананічныя. У дахрысц. і раннехрысц. часы А. лічылі кнігамі вял. мудрасці, глыбокі і патаемны сэнс якіх быў даступны не кожнаму. З пашырэннем ерасяў А. сталі называць творы з ерэтычным ухілам. Царк. цэнзура складала індэксы «фальшывых» кніг, якія падлягалі знішчэнню. У перыяд Кіеўскай Русі на ўсх.-слав. землях шырокую вядомасць набылі А. пра стварэнне Богам Адама, пра цара Саламона, *«Хаджэнне Багародзіцы па пакутах»* (у бел. апрацоўцы 15—16 ст. — «Аб дванаццаці пакутах»), «Страцім-птушка», апакрыфічныя евангеллі Іакава, Фамы, Нікадзіма. У А. адлюстраваліся нар. ўяўленні эпохі феадалізму пра светаўладкаванне, пошукі праўды і дабра. А. паўплывалі на некаторыя жанры бел. фальклору (казкі, духоўныя вершы). Матывы А. выкарыстоўваў М. Багдановіч («Апокрыф», «Страцім-лебедзь»). *Л.Л.Каротkая.*

**АПО́ЛАК**, піламатэрыял, атрыманы з бакавой часткі бервяна. Калі пукаты бок А. не прапілаваны ці прапілаваны менш як на $^1/_2$ даўжыні, А. наз. гарбельным, прапілаваны больш як на $^1/_2$ — дашчаным. А. ідуць на выраб буд. рыштаванняў, апалубкі, мацавання горных выпрацовак і г.д.

**АПО́ЛЕ** (Opole), горад на Пд Польшчы. Адм. ц. *Апольскага ваяводства*. 130 тыс. ж. (1993). Маш.-буд., металаапр., лёгкая (швейная, трыкат., мэблевая), харч., буд. матэрыялаў (шкляная, 2 цэментныя з-ды), паліграф. прам-сць. Порт на р. Одра, вузел чыгунак і аўтадарог. 2 ВНУ, 2 тэатры, музей, заапарк.

Упершыню згадваецца каля 1000 як слав. паселішча. З 1202 рэзідэнцыя *Пястаў*. Перад 1254 атрымаў гарадскія правы. З 1532 А. (ням. Опельн) у складзе Аўстрыі, з 1740 — Прусіі, пасля 1871 — Германіі. З 1945 зноў у Польшчы. Захаваліся кафедральны сабор 15 ст., францысканскі (засн. ў 1287) і дамініканскі (засн. ў 1295) кляштары, камяніцы 15—18 ст., вежа (1300) б. замка Пястаў і інш.

**АПО́ЛЛІ**, узвышаныя слабахвалістыя раўніны (звычайна зандравыя) з урадлівымі цемнаколернымі карбанатнымі і шэрымі ляснымі глебамі на Пд тайгі і ў зонах мяшаных і шыракалістых лясоў Усх.-Еўрапейскай раўніны. Амаль цалкам узараны і густа заселены (напр., Уладзімірскае А. ў Рас. Федэрацыі). На Прыкарпацкай Украіне А. — ландшафты лясістай лагорыстасці.

**АПО́ЛЬСКАЕ ВАЯВО́ДСТВА** (Województwo Opolskie), на Пд Польшчы. Пл. 8,5 тыс. км², нас. 1023 тыс. чал., гарадскога каля 52% (1987). Адм. ц. — г. *Аполе*. Найб. гарады: Кендзежын-Козля, Аполе, Бжэг, Ныса, Крапкавіцы і інш. Размешчана ў Ніжнім Шлёнску, на Апольскай раўніне, Глубчыцкім плато, на Пд заходзяць Судэты (выш. да 889

м), на У — частка Шлёнскага ўзв. (выш. да 400 м). Клімат умераны кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. -1,5 °С, ліп. 18,6 °С, ападкаў 650 мм за год. Гал. рака — Одра з прытокамі. Прам-сць: горназдабыўная, электратэхн., хім., лёгкая, харчовая. Вырошчваюць ячмень, кармавыя культуры, цукр. буракі, бульбу, рапс. Гадуюць буйн. раг. жывёлу, свіней. Турызм.

**АПО́РНАЕ СВІДРАВА́ННЕ**, праходка глыбокіх свідравін з мэтай вывучэння геал. будовы пэўнай тэрыторыі і вызначэння напрамку пошукава-разведвальных работ. Выконваецца з адборам *керну* да глыб. ад некалькіх дзесяткаў метраў да некалькіх кіламетраў (у найб. спрыяльных структурных і стратыграфічных умовах). Адрозніваецца дэталёвым паслойным вывучэннем геал. разрэзу комплексам метадаў: геафіз., літолага-петраграфічных, геахім., гідрагеал., палеанталагічных, геахраналагічных і інш. Да А.с. таксама належыць свідраванне звышглыбокіх свідравін (да 10—15 км) для вывучэння будовы зямной кары і верхняй мантыі Зямлі. На Беларусі планамерна праводзіцца з 1960-х г. з мэтай вывучэння стрататыпаў геал. падраздзяленняў, тэктанічных структур і адкладаў, перспектыўных на карысныя выкапні (нафта, солі, жал. руды, алмазы і інш.).

**АПО́РНАЯ ГЕАДЭЗІ́ЧНАЯ СЕ́ТКА**, сістэма замацаваных на мясцовасці арыенціраў, якія служаць апорнымі пунктамі пры здымках і геад. вымярэннях. Вылучаюць А.г.с. планавую і вышынную. Планавая складаецца пераважна метадамі трыянгуляцыі і паліганаметрыі, узаемнае размяшчэнне яе пунктаў вызначаецца прамавугольнымі каардынатамі (X і У); вышынная — метадам геам. нівеліравання. Выкарыстоўваецца пры вывучэнні формы Зямлі, складанні тапаграфічных картаў, інж. пошуках, у буд-ве і г.д., дзе неабходны дакладныя разлікі на мясцовасці.

*А.В.Саломка.*

**АПО́РНЫ ГАРЫЗО́НТ**, гл. *Маркіроўны гарызонт.*

**АПО́РНЫ ПУНКТ**, 1) у ваеннай справе — найбольш умацаваная і насычаная агнявымі сродкамі частка абарончага раёна (участка, пазіцыі), прыстасаваная для працяглай кругавой абароны ўзвода або роты. Ствараецца на ўчастках мясцовасці, зручных для назірання і вядзення эфектыўнага агню па праціўніку. А.п. мае акопы, траншэі, укрыцці, загароды, хады зносін, пазіцыі для агнявых сродкаў штатных (узвода, роты) і прыдадзеных падраздзяленняў. Прамежкі паміж А.п. прыкрываюцца інж. збудаваннямі і агнём з усіх відаў зброі. 2) У геадэзіі і тапаграфіі — замацаваны на мясцовасці пункт у адзінай сістэме каардынат з планавым размяшчэннем і вышынёй, якая выкарыстоўваецца ў час правядзення геад. і тапагр. здымак (гл. *Апорная геадэзічная сетка*).




Схемы апораў плоскіх стрыжнёвых сістэм: *а* — шарнірная рухомая; *б* — шарнірная нерухомая; *в* — зашчэмленая рухомая; *г* — зашчэмленая нерухомая. Стрэлкамі паказаны апорныя рэакцыі.

**АПО́РНЫ ЛІСТ**, гл. *Ліставая канструкцыя.*

**АПО́РНЫ ПЛАЦДА́РМ**, гл. *Плацдарм.*

**АПО́РНЫ ПУНКТ**, 1) у ваеннай справе — найбольш умацаваная і насычаная агнявымі сродкамі частка абарончага раёна (участка, пазіцыі), прыстасаваная для працяглай кругавой абароны ўзвода або роты. Ствараецца на ўчастках мясцовасці, зручных для назірання і вядзення эфектыўнага агню па праціўніку. А.п. мае акопы, траншэі, укрыцці, загароды, хады зносін, пазіцыі для агнявых сродкаў штатных (узвода, роты) і прыдадзеных падраздзяленняў. Прамежкі паміж А.п. прыкрываюцца інж. збудаваннямі і агнём з усіх відаў зброі. 2) У геадэзіі і тапаграфіі — замацаваны на мясцовасці пункт у адзінай сістэме каардынат з

**АПО́РЫ**, 1) канструкцыі (часткі збудаванняў), якія прымаюць нагрузку ад адных элементаў (дэталяў) і перадаюць яе на інш. элементы ці асновы збудаванняў. У будынках А. бэлек і фермаў служаць *калоны*, нясучыя сцены, верт. стойкі, арак і рам — пераважна *фундаменты*, мастоў — быкі і ўстоі (крайнія А.). Спец. слупы і мачты, замацаваныя на фундаменце ці непасрэдна ў грунце, з'яўляюцца *апорамі ліній электраперадачы* і кантактавай сеткі.

На А. кантактавай сеткі замацоўваюць правады і нясучыя тросы гарадскога электратранспарту, правады паветр. ліній электрыфікаваных чыгунак. Гэтыя А. падзяляюцца на падтрымныя (прамежкавыя, пераходныя), анкерныя (прымаюць нацяжэнне правадоў), фіксавальныя (падтрымліваюць правады ў пэўным становішчы адносна токаздымальніка) і фідэрныя (сілкавальных ліній). Бываюць саманясучыя, з адцяжкамі, кансольныя і інш. Робяцца з жалезабетону, сталі, драўніны (часовыя).

2) У будаўнічай механіцы пры разліку канструкцый разглядаюцца не сапраўдныя А. збудаванняў, а іх разліковыя схемы. У найб. пашыраных *стрыжнёвых сістэмах* адрозніваюць А. шарнірныя, зашчэмленыя, рухомыя і нерухомыя.

**АПО́РЫ ЛІ́НІЙ ЭЛЕКТРАПЕРАДА́ЧЫ**, канструкцыі (збудаванні) для падвешвання правадоў і маланкаахоўных тросаў паветр. *ліній электраперадачы*. Бываюць прамежкавыя (пераважна на прамых участках трасы ЛЭП) і анкерныя (у пачатку і канцы прамых участкаў ЛЭП, на паваротах, пры пераходах праз водныя і інш. перашкоды). Анкерныя А.л.э. прымаюць нацяжэнне правадоў і тросаў, маюць больш жорсткую і трывалую канструкцыю. У залежнасці ад колькасці падвешаных правадоў (ланцугоў) А.л.э. падзяляюцца на адна- і многаланцуговыя; ад канструкцыі — на аднастоечныя, А-, П- і АП-падобныя, свабоднастаячыя, з адцяжкамі. Робяцца з жалезабетону і металу, пераважна са сталі (у асн. для ЛЭП напружаннем 220 кВ і болей), а таксама з дрэва (да 110 кВ у лясных мясцовасцях).

**АПО́СТАЛ** Даніла Паўлавіч (14.12.1654—28.1.1734), апошні выбарны гетман Левабярэжнай Украіны ў 1727—34. Ваенны дзеяч, удзельнік паходаў супраць Турцыі і Крыма, Паўн. вайны 1700—21. У 1708 прымкнуў да І.*Мазепы*, аднак у хуткім часе пакінуў яго. У 1722 удзельнічаў у Персідскім паходзе рус. войскаў. Садзейнічаў росту буйнога феад. землеўладання на Украіне, праводзіў палітыку запрыгоньвання левабярэжнага сялянства і часткі казацтва. Пасля смерці А. выбары гетмана на Украіне забаронены.

**АПО́СТАЛЫ** (грэч. apostolos пасланец), у часы ранняга хрысціянства вандроўныя прапаведнікі, арганізатары і духоўныя настаўнікі хрысц. абшчын. У Новым запавеце 12 А. — першыя паслядоўнікі, вучні Хрыста.

**АПО́СТРАФ** (грэч. apostrophos), надрадковы значок у выглядзе коскі. Указвае на пропуск галосных пры скарачэнні слоў (англ. don't замест do not), аддзяляе артыклі і часціцы ў іншамоўных словах (франц. d'Arc) і інш. У бел. графіку ўведзены ў 1920-я г. Выконвае раздзяляльную функцыю перад галоснымі «е», «ё», «ю», «я», «і» пасля прыставак, якія канчаюцца на зычны, і ў сярэдзіне слоў пасля губных «б», «в», «м», «п», «ф», заднеязычных «г», «к», «х», шыпячых «дж», «ж», «ч», «ш», зубных «д», «т» і альвеалярнага «р». У фанет. транскрыпцыі абазначае змякчэнне зычных. *А.М.Булыка.*

**АПО́СУМЫ** (Didelphidae), сямейства млекакормячых атр. сумчатых. 12 родаў, 84 віды. Пашыраны ў Амерыцы і на М. Антыльскіх а-вах. Самая стараж. група сумчатых. У Паўн. Амерыцы вядомы з ніжняга мелу, у Еўропе — з эацэну да міяцэну. Жывуць на зямлі і дрэвах у лясах, стэпах, пустынях, гарах да 4 тыс. м, зрэдку паўводныя — вадзяны А. Звычайныя А. — лабараторныя жывёлы. Паўночны А. акліматызаваны ў Каліфорніі.

Даўж. цела 7—50 см. Хвост (4—55 см) звычайна хапальны, голы на канцы. Морда выцягнутая і завостраная. Канечнасці ўкарочаныя, пяціпальцыя; заднія крыху даўжэйшыя за пярэднія. Вялікі палец на задніх лапах вял. памераў, процілеставлены іншым. Ёсць сумка. Саскоў ад 5 да 27. За год 1—3 прыплоды па 4—11 (зрэдку да 25) дзіцянят. Усёедныя. Аб'екты промыслу.

**АПО́ЎЗЕНЬ**, адрыў і слізготнае зрушэнне масы горнай пароды ўніз па схіле пад дзеяннем сілы цяжару. Найчасцей узнікаюць на горных схілах рачных далін, высокіх берагах мораў, азёраў, вадасховішчаў, складзеных з нахільных пластоў водатрывалых (гліністых) парод, якія чаргуюцца з ваданоснымі пародамі. Утвараюцца ў рыхлых адкладах і шчыльных пародах у выніку павелічэння стромкасці або падмывання асновы схілу, пераўвільгатнення грунтоў талымі і дажджавымі водамі, сейсмічных штуршкоў, нерацыянальнай гасп. дзейнасці чалавека. Буйныя А. маюць працягласць уздоўж схілу на дзесяткі і сотні метраў і захоўваюць ва ўнутр. ч. пэўную маналітнасць (пры таўшч. 10—20 м і больш); невялікія называюцца *аплывінамі*. Пры А. ўтвараюцца невял. формы рэльефу — тэрасы і ўзгоркі, а таксама спецыфічныя формы расліннасці (напр., «п'яны» лес). А. прычыняюць вял. шкоду нас. пунктам, с.-г. угоддзям, прамысл. прадпрыемствам, гасп. інфраструктуры і інш. На Беларусі яны адзначаюцца каля стромкіх схілаў рачных далін, глыбокіх яроў. Каб прадухіліць А., умацоўваюць берагі, схілы, праводзяць дрэнажныя работы, лесапасадкі і інш.

**АПРАБА́ЦЫЯ** (лац. approbatio), 1) афіцыйнае ўхваленне, зацвярджэнне, вынесенае на падставе выпрабавання, праверкі, шырокага абмеркавання. 2)У сельскай гаспадарцы — абследаванне сартавых пасеваў і пладова-ягодных насаджэнняў для вызначэння сапраўднасці сорту, сартавых якасцяў і ўраджайнасці, праверкі выканання правілаў насенняводства. А. палявых культур праводзіцца ў полі праз агляд, адбор і аналіз апрабацыйнага матэрыялу. Для кожнай культуры прадугледжана методыка А., напр., фаза развіцця раслін у момант А., плошча (у га) для адбору снапа, колькасць сцяблоў у снапе і г.д. Палявой А. падлягаюць усе сартавыя насенныя пасевы. Астатнія сартавыя пасевы рэгіструюць на аснове сартавых дакументаў. Вынікі аналізу запісваюць у акт А.

**АПРА́КСІН** Фёдар Мацвеевіч (1661—10.11.1728), расійскі ген.-адмірал (1708), адзін са стваральнікаў рас. флоту. З 1682 стольнік Пятра I, у 1693—96 дзвінскі ваявода і губернатар Архангельска. З 1700 гал. начальнік Адміралцейскага прыказа і азоўскі губернатар. У час Паўн. вайны 1700—21 атрымаў на моры шэраг перамог над шведамі. У 1712—23 кіраваў Эстляндыяй, Інгерманландыяй і Карэліяй. З 1718 прэзідэнт Адміралцействаў-калегіі. У час Перс. паходаў (1722—23) камандаваў Каспійскай флатыліяй, у 1723—26 — Балт. флотам.

**АПРАМЯНЁННЕ АРГАНІ́ЗМА**, прыроднае або штучнае ўздзеянне *выпрамяненняў* на жывы арганізм. У натуральных умовах жывыя істоты апраменьваюцца інфрачырвоным (цеплавое апрамяненне), бачным і ультрафіялетавым сонечным святлом, а таксама касм. прамянямі і іанізоўным выпрамяненнем зямнога паходжання (гл. *Фон радыеактыўны*). Пры штучным А.а. часцей скарыстоўваюць іанізавальныя, ультрафіялетавыя, ультравысокачастотныя выпрамяненні. Адрозніваюць А.а. татальнае (усяго цела) і лакальнае (участковае), вострае (за кароткі прамежак часу) і хранічнае, або пралангаванае (працяглае), аднаразовае і фракцыянаванае (сумарная доза паступае часткамі, з рознымі прамежкамі часу), вонкавае і ўнутр. ч. пэўную маналітнасць (пры таўшч. 10—20 м і больш); невялікія называюцца *аплывінамі*. Пры А. ўтвараюцца невял. формы рэльефу — тэрасы і ўзгоркі, а таксама спецыфічныя формы расліннасці (напр., «п'яны» лес). А. прычыняюць вял. шкоду нас. пунктам, с.-г. угоддзям, прамысл. прадпрыемствам, гасп. інфраструктуры і інш. На Беларусі яны адзначаюцца каля стромкіх схілаў рачных далін, глыбокіх яроў. Каб прадухіліць А., умацоўваюць берагі, схілы, праводзяць дрэнажныя работы, лесапасадкі і інш.



**Апоры ліній электрапередачы:** *а* — драўляная свабоднастаячая П-падобная; *б* — жалезабетонная аднастоечная з адцяжкамі; *в* — металічная двухланцуговая.

**Апосум паўночны.**




**Апоўзень:** 1 — пачатковае становішча схілу; 2 — непарушаны схіл; 3 — апоўзневы блок; 4 — паверхня слізгання; 5 — пляцоўка апоўзневай тэрасы; 6 — сцяна зрыву апоўзня; 7 — напорны апоўзневы вал; 8 — урэз ракі.

транае (ад радыеактыўных рэчываў, што трапілі ў арганізм). Па даных Навук. к-та ААН па дзеянні атамнай радыяцыі (НКДАР ААН; 1988) сярэднія дозавыя нагрузкі насельніцтва Зямлі ў пераліку на гадавыя эфектыўныя эквівалентныя дозы апрамянення складаюць у мілізівертах (мЗв): ад натуральных крыніц радыяцыі зямнога паходжання пры ўнутр. апрамяненні 1,325, пры вонкавым 0,35; касмічнага паходжання 0,3 і 0,015 адпаведна; ад крыніц, якія выкарыстоўваюцца ў медыцыне, 0,4; ад радыеактыўных ападкаў 0,02; ад атамнай энергетыкі 0,001. На тэр., што пацярпелі ад буйных радыяц. катастроф (напр., Кыштымская 1957, Расія; Чарнобыльская 1986, і інш.), пасляаварыйныя дозавыя нагрузкі на арганізм значна адрозніваюцца ад сярэдніх. Напр., праз 5 гадоў пасля Чарнобыльскай катастрофы на Гомельшчыне гадавая эфектыўная эквівалентная доза апрамянення складала (мЗв): у Брагіне 2,5, Ветцы 3,1, Буда-Кашалёве 1,3, Карме 2. У «Каталог дозаў апрамянення насельніцтва Рэспублікі Беларусь» (1992) занесена 3326 нас. пунктаў, дзе шчыльнасць забруджвання цэзіем-137 складала 15—40 Кі/км$^2$ і сумарныя гадавыя эквівалентныя дозы да 2—3 мЗв. Гл. таксама *Біялагічнае дзеянне іанізавальных выпрамяненняў*.

скаць малекулы вады, але затрымліваць гідратызаваныя іоны раствораных у вадзе соляў.

**АПРАСНЯ́ЛЬНІК**, тэхнічная сістэма для *апраснення вады*. Дыстыляцыйныя А. — найб. пашыраныя, бываюць аднаі многаступеньчатыя. У апошніх награванне і выпарэнне вады ў 1-й ступені робіцца парай, якая паступае з парагенератара, а кожная наступная ступень абагравается «другаснай» парай, што ўтвараецца ў папярэдняй ступені. Кандэнсат пары, якая абагравае 1-ю ступень, вяртаецца ў кацёл, а кандэнсат, што ўтвараецца ў астатніх ступенях, падаецца спажыўцам. У многаступеньчатых А. з імгненным закіпаннем салёная вада паслядоўна паступае ў камеры з паніжаным ціскам, дзе часткова выпараецца; кандэнсат збіраецца ў паддоне. Існуюць таксама А., у якіх выкарыстоўваюць метады электролізу, гіперфільтрацыі, вымарожвання.

**АПРАЎДА́ННЕ**, прызнанне судом падсуднага невінаватым у прад'яўленым яму абвінавачанні. Апраўдальны прыгавор выносіцца ў выпадках, калі не ўстаноўлены факт злачынства, у дзеяннях падсуднага адсутнічае склад злачынства або не даказаны яго ўдзел у злачынстве. Пры А. суд павінен неадкладна вызваліць падсуднага з-пад варты, калі ён быў да гэтага арыштаваны. *І.І.Пацяружа.*




**Апрасненне вады** ў многаступеньчатым дыстыляцыйным апрасняльніку з імгненным закіпаннем: *I—IV*, N — камеры выпарэння; 1 — падагравальнік; 2 — кандэнсатар эжэктара; 3 — паравыя эжэктары; 4 — кандэнсатары; 5 — пырскаўлоўнікі; 6 — паддоны для збору кандэнсату; 7 — помпы.

**АПРАСНЕ́ННЕ ВАДЫ́**, апрацоўка марской вады ці вады моцнамінералізаванай крыніцы з мэтай зніжэння канцэнтрацыі раствораных соляў да ступені (звычайна да 1 г/л), пры якой вада становіцца прыдатнай на піццё ці гасп. мэты. Робіцца ў *апрасняльніках*.

Пры А.в. выпарэннем салёную ваду награваюць, пару кандэнсуюць. Пры А.в. вымарожваннем выкарыстоўваюць уласцівасць салёнай вады пры замярзанні ўтвараць крышталі прэснага лёду, паміж якімі знаходзяцца крышталі салёнага лёду. Пры раставанні ў вадкі стан спачатку пераходзяць крышталі салёнага лёду, што і дазваляе аддзяліць салёную ваду ад прэснай. Пры электролізным спосабе катыёны і аніёны раствораных у вадзе соляў пад дзеяннем пастаяннага эл. поля выдаляюцца праз спец. мембраны, якія не прапускаюць прэснай вады. Гіперфільтрацыйны метад заснаваны на ўласцівасці мембран, зробленых з ацэтылцэлюлозы ці паліамідных смолаў, пры ціску, вышэйшым за асматычны, прапускаюць малекулы вады, але затрымліваюць гідратызаваныя іоны раствораных у вадзе соляў.




Схема аднаступеньчатага дыстыляцыйнага **апрасняльніка**: 1 — корпус выпарной камеры; 2 — пырскаўлоўнік; 3 — кандэнсатар; 4 — помпа; 5 — награвальны элемент.




Распускальная **апраўка**: 1 — конусны стрыжань; 2 — гайкі.

**АПРА́ЎКА**, 1) прыстасаванне, якое выкарыстоўваецца для мацавання на ім пустацелых вырабаў ці інструментаў пры апрацоўцы на металарэзных станках; від *аснасткі тэхналагічнай*. Бывае суцэльная — у выглядзе метал. стрыжня канічнай, цыліндрычнай ці камбінаванай формы, і распускальная — у выглядзе пустацелага цыліндра з конусным стрыжнем унутры. А. надае інструменту, дэталям і загатоўкам неабходнае становішча, папярэджвае магчымае працісканне сценак вырабаў, памяншэнне дыяметра адтулін і інш. 2) Інструмент (цыліндрычны стрыжань), які ўстаўляецца ў поласць вырабаў пры коўцы, раскачванні кальцавых паковак, пракатцы трубаў з патанчэннем сценак, выпраўленні змятых трубаў і інш.

**АПРАЦО́ЎКА** ў м у з ы ц ы, у шырокім сэнсе — змяненне арыгінальнага нотнага тэксту муз. твора з пэўнай мэтай: прыстасаванне яго для выканання інш. складам выканаўцаў (*аранжыроўка*), прывядзенне ў адпаведнасць з тэхн. узроўнем пэўнага кантынгенту выканаўцаў (аблегчанае пералажэнне або, наадварот, віртуозная *транскрыпцыя*), стварэнне акордавага суправаджэння да аднагалосай мелодыі (*гарманізацыя*), мадэрнізацыя твора. А. называюць таксама далучэнне інстр. суправаджэння да нар. песні або яе харавое выкладанне.

А. нар. мелодый займаліся з канца 18 ст. многія вядомыя кампазітары (І.Гайдн, Л.Бетховен, І.Брамс, М.Балакіраў, М.Рымскі-Корсакаў, П.Чайкоўскі, А.Лядаў і інш.). Падобныя А. паступова вылучыліся ў самаст. муз. жанр, які атрымаў вял. развіццё ў многіх нац. кампазітарскіх школах, у т.л. ў беларускай. *С.Г.Нісневіч.*

**АПРАЦО́ЎКА ГЛЕ́БЫ**, прыёмы мех. ўздзеяння на глебу, якія павышаюць яе ўрадлівасць і ствараюць лепшыя ўмовы для росту і развіцця раслін. Сукупнасць паслядоўных прыёмаў уздзеяння складаюць сістэму А.г. Адрозніваюць сістэмы асн. і перадпасяўной апрацоўкі, а таксама зямель, схільных да эрозіі. Ва ўмовах Беларусі найб. выкарыстоўваюцца дыскаванне, ворыва, культывацыя, баранаванне, выраўноўванне, прыкочванне, міжрадковая апрацоўка. Пры А.г. ствараецца рыхлы дробнакамякаваты ворны слой, паляпшаюцца водны, паветраны і цеплавы рэжымы глебы, знішчаюцца пустазелле, шкоднікі, узбуджальнікі хвароб раслін, загортваюцца ў глебу ўгнаенні, дзярніна, іржышча і інш. раслінныя рэшткі, ствараюцца найлепшыя ўмовы для сяўбы і прарастання насення. Гл. таксама *Агратэхніка*.

**АПРАЦО́ЎКА ДРАЎНІ́НЫ**, сукупнасць тэхнал. працэсаў, звязаных з наданнем драўніне і вырабам формы, памераў і ўласцівасцяў. Для А.д. выкарыстоўва-

юць *лесапільныя рамы, круглапільныя станкі, дрэварэзальны інструмент, дрэваапрацоўчыя станкі* і інш. Асн. спосабы А.д.: рэзанне (дзяўбанне, лушчэнне, пілаванне, свідраванне, струганне, фрэзераванне, шліфаванне), гнуццё, прасаванне, расколванне (гл. *Сталярныя работы, Цяслярныя работы*).

А.д. ўключае таксама сушку і вымочванне для выдалення раслінных сокаў, насычэнне драўніны сінт. смоламі, аміякам (мадыфікацыя драўніны), *антыпірэнамі*, антысептычнымі сродкамі (кансерваванне), аддзелку вырабаў, пры якой ствараюцца дэкаратыўнаахоўныя пакрыцці з лакафарбавых ці плёначных матэрыялаў. Аддзелка ўключае падрыхтоўку паверхні (фарбаванне, грунтаванне, шпакляванне, шліфаванне), нанясенне тэкстурнага малюнка, лакафарбавых матэрыялаў (у распыляльных камерах, рэзервуарах, пры дапамозе лаканаліўных машын), высушванне пакрыццяў (у сушыльных ці апрамяняльных камерах), аздабленне (машынамі для выраўноўвання і паліравання), пакрыццё плёначнымі матэрыяламі (многаперацыйнымі агрэгатамі). Спец. віды А.д. — *разьба па дрэве*, выпальванне, інкрустацыя. Гл. таксама *Дрэваапрацоўчая прамысловасць*.

*Літ.:* Прозоровский Н.И. Технология отделки столярных изделий. 5 изд. М., 1991; Амалицкий В.В., Любченко В.И. Справочник молодого станочника по деревообработке. 2 изд. М., 1978.

**АПРАЦО́ЎКА МЕТА́ЛАЎ ЦІ́СКАМ**, сукупнасць тэхнал. працэсаў, у выніку якіх адбываецца пластычная дэфармацыя загатовак без парушэння іх суцэльнасці пад уздзеяннем прыкладзеных вонкавых сіл. Асн. віды А.м.ц.: *пракатка, прасаванне, валачэнне, коўка, штампоўка, гібка*; абсталяванне: *пракатныя станы, прэсы, валачыльныя станы, молаты*, гібачныя машыны.

Апрацоўваюць ціскам большасць металаў і сплаваў, за выключэннем крохкіх (напр., чыгуноў), пераважна ў гарачым стане (пры т-ры больш высокай, чым т-ра *рэкрышталізацыі*). Пасля халоднай апрацоўкі (робіцца звычайна пры пакаёвай т-ры) пластычныя ўласцівасці металаў узнаўляюць *адпалам*. Часам выкарыстоўваюць і цёплую апрацоўку (пры прамежкавых т-рах). А.м.ц. дае магчымасць павысіць трываласць, зменшыць шурпатасць паверхні (напр., абкаткай ролікамі) вырабаў, паменшыць расход металу, лягчэй механізуецца і аўтаматызуецца.

Тэорыя А.м.ц. займаецца вызначэннем намаганняў, што абумоўліваюць пластычнае дэфармаванне; разлікам памераў і формаў загатовак; вывучае заканамернасці пластычнага цячэння металаў, уплыў А.м.ц. на мех. і фіз. ўласцівасці металаў. Звязана з дасягненнямі *фізікі металаў* і *пластычнасці тэорыі*. Заснавана рус. вучоным Дз.К.Чарновым, развіта і выкладзена ў працах рус. і бел. вучоных С.І.Губкіна, А.І.Цэлікава, А.П.Чакмарова, Г.М.Паўлава, В.П.Севярдэнкі, В.С.Смірнова, В.М.Чачына, А.В.Сцепаненкі і інш. На Беларусі работы ў галіне А.м.ц. вядуцца ў Фіз.-тэхн. ін-це АН, Бел. політэхн. акадэміі і інш.

**АПРАЦО́ЎЧАЯ ПРАМЫСЛО́ВАСЦЬ**, уключае галіны вытв-сці па перапрацоўцы прамысл. і с.-г. сыравіны. Да яе адносяцца прадпрыемствы па вытв-сці чорных і каляровых металаў, пракату, хім. і нафтахім. прадуктаў, машын і абсталявання, вырабаў дрэваапр. і цэлюлозна-папяровай прам-сці, цэменту і інш. буд. матэрыялаў, прадпрыемствы па рамонце прамысл. вырабаў, цеплаэлектрастанцыі, тэкстыльная, мясная, цукр. прам-сць і інш. Доля А.п. ва ўсёй прамысл. прадукцыі адлюстроўвае ступень індустр. развіцця краін і прагрэсіўнасць галіновай структуры прам-сці. У структуры прам-сці Беларусі пераважае А.п.

**АПРАЦО́ЎЧЫ ЦЭНТР**, многааперацыйны станок з лікавым праграмным кіраваннем. Аснашчаны інструментальным магазінам вял. ёмістасці і прыстасаваннямі для аўтам. змены інструменту. Дае магчымасць весці комплексную мех. апрацоўку вял. колькасці паверхняў загатоўкі рознымі спосабамі — тачэннем, фрэзераваннем, свідраваннем і інш. Кіраванне працэсамі апрацоўкі загатовак ажыццяўляецца па зададзенай праграме. Высокая прадукцыйнасць спалучаецца з магчымасцю рознаварыянтнай і хуткай пераналадкі.

**АПРО́ШЧАННЕ** ў мовазнаўстве, марфалагічны працэс; знікненне межаў паміж марфемамі, у выніку чаго з дзялімай асновы атрымліваецца недзялімая. Напр., бел. «воблака» <*ob=vlakъ<*ob=volkъ. А. — частая з'ява пры запазычанні: бел. «варштат» < польск. warsztat < ням. Werkstatt ням. Werk 'праца' + Stätte 'месца'. З А. звязаны працэс дээтымалагізацыі і страты сувязі паміж роднаснымі словамі (бел. «трава — атрута», рус. «нож — заноза») і фузійны тып далучэння марфем (гл. *Фузія*). Тэрмін прапанаваны В.А.Багародзіцкім. *А.А.Кожынава.*

**АПРО́ШЫ** (франц. approches), у ваеннай справе — глыбокія, вузкія зігзагападобныя равы, размешчаныя паміж траншэямі. Ствараліся пры атацы крэпасцяў і ўмацаваных пазіцый для збліжэння з праціўнікам, а таксама для сувязі паміж траншэямі. Упершыню выкарыстаны англічанамі пры аблозе Руана (1418), французамі пры аблозе Мялюна (1420). З пач. 20 ст. тэрмін не ўжываецца, у сучаснай фартыфікацыі заменены на хады зносін.

**АПРЫЁРЫ**, гл. *Апастэрыёры і апрыёры.*

**АПРЫ́ЛАЎ** Васіл Еўстаціеў (21.7.1789, г. Габрава — 2.10.1847), балгарскі грамадска-паліт. дзеяч, асветнік, педагог і пісьменнік. Адукацыю атрымаў у Расіі, Германіі і Венскім ун-це. У 1835 заснаваў у Габраве першую свецкую школу. Аўтар прац «Балгарскія кніжкі, ці Якому славянскаму племю ўласна належыць кірылаўская азбука» (1841), «Думкі пра цяперашняе балгарскае навучанне» (1847) і інш. Творчасць А. спрыяла адраджэнню нац. свядомасці балгараў, іх самабытнай культуры і традыцый.

**АПРЫ́ЧНІНА**, апрышніна, 1) у 14—15 ст. асобнае ўдзельнае ўладанне жанчын з велікакняжацкай сям'і. 2) Назва ўласнага ўдзелу Івана IV у 1565—72 з асобнай тэрыторыяй, войскам і дзярж. апаратам. 3) Сістэма надзвычайных ваенна-адм., сац.-эканам. мерапрыемстваў Івана IV у 1565—72 для ўмацавання самадзярж. улады, ліквідацыі феад. раздробленасці, барацьбы з непакорнымі феадаламі. Мэтай А. абвяшчалася выкараненне «крамолы». Ажыццяўлялася апрычнікамі, якія мелі неабмежаваныя правы і ўладу, былі непадсудныя органам улады і суда. Суправаджалася жорсткімі расправамі з баярска-княжацкай апазіцыяй, масавымі смяротнымі пакараннямі часта невінаватых людзей, зямельнымі канфіскацыямі і інш. Асабліва жорсткія рэпрэсіі чынілі А.Д. Басманаў, А.І.Вяземскі, Р.Л.Скуратаў-Бельскі і інш. У выніку А. выкаранены феад. сепаратызм, умацаваны самадзярж. дэспатызм і яго сац. апора — служылыя людзі, дваране і сярэднія землеўладальнікі; узмоцнена прыгонніцтва, збяднела значная частка насельніцтва, асабліва пасадскія людзі.

У 1572 А. адменена, частка канфіскаваных земляў вернута іх б. уладальнікам.

*Літ.:* Кобрин В.Б. Власть и собственность в средневековой России (XV—XVI вв.). М., 1985. С. 136—160; Ключевский В.О. Русская история: Полн. курс лекций. М., 1993. Кн. 1. С. 483—495; Соловьев С.М. Соч. М., 1989. Кн. 3, т. 5—6. С. 506—547.

**АПРЫ́ШКІ**, удзельнікі нар.-вызв. руху ў зах. раёнах Украіны (Галіччына, Буковіна, Закарпацце) у 16—1-й пал. 19 ст. Выступалі супраць феад. прыгнёту з боку польск. і ўкр. шляхты, аўстр., венг. і малд. памешчыкаў. Найб. вядомыя выступленні А. у 1730—40 пад кіраўніцтвам А.*Доўбуша*.

**АПРЭТАВА́ННЕ** (ад франц. apprêter апрацоўваць), апрацоўка тэкстыльных вырабаў з мэтай надання ім калянасці, незмінальнасці, гідрафобнасці, негаручасці і інш. Ажыццяўляецца прамочваннем ці паверхневай апрацоўкай вырабу спец. рэчывамі (апрэтамі). Для надання калянасці карыстаюцца водараствараль-нымі эфірамі цэлюлозы (карбаксіметылцэлюлозай), крухмалам; незмінальнасці — аміна-фармальдэгіднымі смоламі; гідрафобнасці — крэмнійарган. вадкасцямі; пругкасці — сінт. латэксамі. Гл. таксама *Тэкстыльна-дапаможныя рэчывы*.

**АПСІ́ДА**, абсіда [ад грэч. hapsis (hapsidos) скляпенне], канструкцыйна самастойная частка культавага збудавання; выступ будынка (прамавугольны, шматвугольны, паўкруглы ў плане), які перакрыты паўкупаламі ці самкнутым скляпеннем. Упершыню з'явілася ў стараж.-рымскіх *базіліках*, адкуль перайшла ў хрысціянскія храмы. У А. размяшчаюцца алтар, клір, месца для вышэйшых духоўных і свецкіх асоб, культавыя рэліквіі і г.д. У каталіцкіх храмах дапаўнялася *прэсбітэрыем*.

**АПТА́ЦЫЯ** (ад лац. optatio жаданне), у міжнародным праве выбар асобай грамадзянства паводле закону або міжнар. дагавора. Адбываецца пры пераходзе

тэрыторыі ад адной дзяржавы да другой, пры вырашэнні пытанняў пра асоб з двайным грамадзянствам (*біпатрыдаў*), пры абмене насельніцтвам. Дзеці пры А. звычайна прымаюць грамадзянства бацькоў. Міжнар. права не мае адзінай агульнапрызнанай рэгламентацыі А. Паводле заканадаўства Рэспублікі Беларусь і яе пагадненняў з інш. краінамі А. праводзіцца на добраахвотных пачатках з улікам інтарэсаў бакоў. Так адбывалася А. на аснове бел.-польск. пагадненняў пасля вызвалення тэр. Беларусі і Польшчы ад нямецка-фашыстаў.

**АПТО́ВЫ ГА́НДАЛЬ**, а п т о в ы п р о д а ж, 1) гандаль партыямі тавараў вытв. прызначэння і асабістага ўжытку паміж прадпрыемствамі і гандл. арг-цыямі. Адрозніваюць гандл. абарот па *матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні, закупках сельскагаспадарчых прадуктаў* і рэалізацыі тавараў нар. ўжытку. 2) У рыначнай эканоміцы — продаж тавараў (паслуг) партыямі ці вял. колькасцю тым, хто набывае іх з мэтай перапродажу або на ўласныя патрэбы.

Апсіда Троіцкага касцёла ў г.п. Ружаны Пружанскага раёна Брэсцкай вобл.

**АПТРО́Н**, прылада, якая складаецца з крыніцы святла (святловыпрамяняльны дыёд), аптычна спалучанай з прыёмнікам святла (фотарэзістар, фотадыёд, фототранзістар і інш.). Элементы А. змешчаны ў агульным корпусе, электрычна ізаляваны. У А. выконваецца прамое і адваротнае электронна-аптычнае пераўтварэнне. Выкарыстоўваецца для сувязі паміж асобнымі вузламі электронных прылад, напр. у выліч. і вымяральнай тэхніцы і аўтаматыцы.

**АПТЫМА́ЛЬНАЕ КІРАВА́ННЕ**, раздзел *матэматыкі*, які вывучае кіраванне сістэмамі, тэхн. аб'ектамі і інш., што забяспечвае найлепшае (аптымальнае) працяканне працэсаў у пэўным, папярэдне вызначаным кірунку. Дае магчымасць рэалізаваць мэту кіравання за найменшы магчымы час або з найбольшым эканам. эфектам.

Першыя задачы А.к. пастаўлены ў пач. 1950-х г. пры вывучэнні дынамікі лятальных апаратаў і працэсаў аўтам. рэгулявання. Пытанні аптымізацыі аб'ектаў кіравання разглядаюцца ў тэорыі А.к., якая грунтуецца на некласічных варыяцыйных задачах (гл. *Варыяцыйнае злічэнне*) адшукання экстрэмумаў функцыяналаў па рашэннях ураўненняў, што апісваюць аб'екты кіравання, і кіраванняў, дзе рэалізуецца экстрэмум; пры гэтым абмежаванні параметраў кіравання выражаюцца нястрогімі няроўнасцямі (могуць прымаць і граничныя значэнні). Задачы рашаюцца рознымі метадамі, найбольш агульныя — прынцып максімуму і метад дынамічнага праграмавання.

Асновы матэм. тэорыі А.к. закладзены работамі сав. матэматыка Л.С.Пантрагіна і амер. матэматыка Р.Белмана. На Беларусі даследаванні па праблемах А.к. пачаліся ў 1966 пад кіраўніцтвам Я.А.Барбашына і вядуцца ў БДУ і Ін-це матэматыкі АН Беларусі.

*Літ.:* Математическая теория оптимальных процессов. 4 изд. М., 1983; Габасов Р., Кириллова Ф.М. Качественная теория оптимальных процессов. М., 1971.

*Р.Габасаў, Ф.М.Кірылава.*

**АПТЫМА́ЛЬНАЯ СІСТЭ́МА** ў т э х н і ц ы, сістэма, для якой пэўны крытэрый прымае найб. (ці найменшае) значэнне з мноства магчымых. Вынік працэсу *аптымізацыі*. Крытэрыем аптымальнасці можа быць хуткадзеянне, дакладнасць, затраты энергіі або матэрыялу і інш. Прыклады А.с. — сістэмы аўтам. кіравання самалётаў і караблёў, аптымальныя канструкцыі ў буд-ве і машынабудаванні (аптымальны профіль крыла самалёта, аптымальная аэрадынамічная форма кузава аўтамабіля), аптымальныя тэхнал. працэсы (награванне металу ў печах з мінім. акаліначаўтварэннем).

**АПТЫМА́ТЫ** (ад лац. optimates знатныя), ідэйна-палітычная плынь у Стараж. Рыме ў канцы 2—1 ст. да н. э. Абапіраючыся на сенат, А. абаранялі інтарэсы арыстакратыі (*набілітэта*), выступалі за захаванне алігархічнай (арыстакратычнай) рэспублікі. Супрацьстаялі *папулярам*, якія адстойвалі інтарэсы *плебеяў*.

**АПТЫМЕ́ТР** (ад грэч. optos бачны + *...метр*), оптыкамеханічная прылада для найб. дакладных вымярэнняў лінейных памераў дэталяў. З дапамогай А. вызначаюць памер у межах шкалы (абс. метады вымярэння) ці параўноўваюць лінейны памер з канцавой мерай даўжыні або з эталонам (адносны метад). Пераўтваральны элемент А. — рычажна-аптычнае прыстасаванне: рычажная перадача — рухомае дзюстэрка і пераўтваральнік — аўтакаліматар. Бываюць верт. і гарызантальныя; з акулярам або з праекцыйным экранам. Цана дзялення да 0,2 мкм, межы вымярэнняў да 500 мм. А. забяспечваецца зменнымі прыстасаваннямі для вымярэнняў сярэдняга дыяметра разьбы, даўжыняў канцавых мер, спец. галоўкай для вымярэнняў адтулін дыяметрам ад 1 да 13,5 мм, праекц. насадкай для акулярных трубак і інш.

**АПТЫМІЗА́ЦЫІ ЗАДА́ЧЫ І МЕ́ТАДЫ**, раздзел *матэматыкі*, у якім вывучаюцца ўласцівасці розных класаў задач, што грунтуюцца на выбары сярод некаторага мноства найлепшага з дазволеных рашэнняў (аптымізацыйныя задачы). Кожная задача ўключае фармальнае апісанне мноства рашэнняў і крытэрыяў аптымальнасці. У залежнасці ад інфармаванасці асобы, што прымае рашэнне, задачы бываюць дэтэрмінаваныя (адзіны інфарм. стан), нявызначаныя (мноства інфарм. станаў; звычайна разглядаюцца ў *гульняў тэорыі*) і стахастычныя (кожны з мноства інфарм. станаў мае пэўную імавернасць); у залежнасці ад уласцівасцяў мноства рашэнняў і крытэрыяў аптымальнасці выбару — аднакрытэрыяльныя (патрабаванні мінімізацыі або максімізацыі адной мэтавай функцыі) і многакрытэрыяльныя (некалькіх мэтавых функцый). Могуць быць зададзены і спецыфічныя суадносіны пераваг адных рашэнняў перад інш. магчымымі. Матэм. асновай распрацоўкі лікавых метадаў аптымізацыі з'яўляюцца матэм. аналіз, лінейная алгебра, тэорыя імавернасцяў і інш. Для рашэнняў аптымізацыйных задач распрацаваны шэраг пакетаў праграм.

*Літ.:* Габасов Р., Кириллова Ф.М. Методы оптимизации. 2 изд. Мн., 1981; Васильев Ф.П. Численные методы решения экстремальных задач. 2 изд. М., 1988; Карманов В.Г. Математическое программирование. 3 изд. М., 1986.

*В.С.Танаеў.*

**АПТЫМІЗА́ЦЫЯ** (ад лац. optimus найлепшы), 1) працэс выбару найлепшага варыянта з некалькіх магчымых. 2) Прывядзенне пэўнай сістэмы ў найлепшы (аптымальны) стан. 3) У т э х н і ц ы — працэс паляпшэння характарыстык тэхн. сістэмы, канструкцыі, тэхнал. працэсу праз пошук параметраў, пры якіх дасягаецца найб. (ці найменшае) значэнне крытэрыю аптымальнасці. Калі крытэрыяў некалькі, А. будзе многакрытэрыяльнай.

У працэсе праектавання тыповай з'яўляецца сітуацыя нявызначанасці, калі ёсць мноства магчымых варыянтаў тэхн. рашэння. А. знімае гэтую нявызначанасць звужэннем дапушчальных рашэнняў і выбарам найлепшага (аптымальнага). Для ажыццяўлення А. тэхн. задач з дапамогай метадаў *аперацый даследаванняў* фармулюецца як матэм. задача А., якая ўключае крытэрый аптымальнасці, матэм. мадэль аб'екта, а таксама абмежаванні на магчымыя значэнні параметраў. А. — неад'емная частка працэсу праектавання тэхн. сістэм, дасягаецца пры *аўтаматызацыі праектавання* на аснове камп'ютэрных сістэм і інфарм. тэхналогій. Вынік А. — канкрэтная *аптымальная сістэма*.

*Літ.*: Батищев Д.И. Методы оптимального проектирования. М., 1984. *А.Ф.Апейка.*

**АПТЫМІ́ЗМ І ПЕСІМІ́ЗМ**, процілеглыя і адначасова ўзаемазвязаныя формы ўспрымання свету, тэндэнцый і заканамернасцяў яго развіцця. Залежаць ад перавагі спрыяльных, стваральных і жыццесцвярджальных, або, наадварот, неспрыяльных і разбуральных пачаткаў. Абазначаюць веру ці нявер'е ў будучае, у здольнасць чалавецтва арганізаваць сваё жыццё на аснове ідэалаў дабра, справядлівасці і г.д. Надаюць пэўную афарбоўку розным ідэйна-паліт. плыням, ідэалогіям, філас. вучэнням, праграмам практычнага дзеяння. Аптымізм становіцца пануючым настроем у эпоху грамадскага ўздыму і пераходу да новага, больш высокага ў параўнанні з ранейшым якаснага стану. Калі пераход заканчваецца і ў грамадстве ўзнікаюць новыя праблемы і цяжкасці, супярэчнасці абвастраюцца, уздым перарываецца спадамі і крызісамі, узмацненнем рэгрэсіўных тэндэнцый у грамадскім жыцці, аптымізм, як правіла, саступае месца песімізму. Крыніцай песімістычных настрояў і змрочных глабальных прагнозаў на будучыню служыць і заснаваная на драпежніцкіх адносінах да прыроды «цывілізацыя спажывання» (экалагічны песімізм). А. і п. здольныя адыгрываць актыўную канструктыўную ролю ў пошуках адказаў на пытанні, што ўзнікаюць перад грамадствам.

*Літ.*: Мечников И.И. Этюды оптимизма. М., 1988; Жибуль И.Я. Экологические потребности: сущность, динамика, перспективы. Мн., 1991. *В.І.Боўш.*

**АПТЫМІСТЫ́ЧНАЯ ПЯЧО́РА**, карставая гіпсавая пячора на Украіне, на З Падольскага ўзвышша, у міжрэчны рэк Серэт і Збруч. Гарызантальная, месцамі шматпавярховая, з буйнымі гротамі (Зялёны, Перакрыжаванне, Геолагаў і інш.). Па агульнай працягласці падземных хадоў і галерэй (157 км) займае 1-е месца ў Еўропе і 3-е ў свеце. У зах. ч. — азёры. Карнізы, друзы, гіпсавыя кветкі, сталактыты, нацёкі. Трапляецца пячорны жэмчуг. Адкрыта ў 1966. Помнік прыроды. Спелеатурызм.

**АПТЫ́ЧНАГА СТАНКАБУДАВА́ННЯ І ВА́КУУМНАЙ ТЭ́ХНІКІ НДІ** Міністэрства прамысловасці Рэспублікі Беларусь. Засн. ў 1987 у Мінску на базе Мінскага філіяла Усесаюзнага н.-д. тэхнал. ін-та аптычнага прыладабудавання (з 1972). Асн. кірунак даследаванняў — распрацоўка абсталявання і вакуумнай тэхнікі для выт-сці аптычных дэталяў дыяметрам ад 1 да 1600 мм, мед. абсталявання, абсталявання для лікёра-гарэлачнай выт-сці, апрацоўкі шкурак пушных звяроў.

**АПТЫ́ЧНАЯ АКТЫЎНАСЦЬ**, здольнасць *актыўнага асяроддзя* выклікаць вярчэнне плоскасці палярызацыі святла, што праз яго праходзіць. Натуральная А.а. абумоўлена несіметрычнай будовай малекул рэчываў (цукар, камфора, вінная кіслата і інш.; гл. *Аптычная ізамерыя*) або выклікана спецыфічнай арыентацыяй малекул (іонаў) у элементарных ячэйках крышталёў (кварц, кінавар і інш.). Крышталі такіх рэчываў не маюць пунктаў, восяў і плоскасцяў сіметрыі, заўсёды існуюць у 2 люстраных формах — правай і левай (гл. *Энантыямарфізм*). Штучная А.а. выяўляецца ў выніку вонкавых уздзеянняў, напр., магн. поля (гл. *Фарадэя эфект*). А.а. вымяраецца з дапамогай палярыметраў, цукраметраў, спектрапалярыметраў і інш. На аснове А.а. ў малекулярнай фізіцы і хіміі распрацаваны метады даследавання прасторавай структуры малекул, палімераў, крышталёў, унутры- і міжмалекулярных узаемадзеянняў.

**АПТЫ́ЧНАЯ ВОСЬ**, 1) напрамак у аптычна анізатропных крышталях, уздоўж якога святло праходзіць без *падвойнага праменепераламлення*. 2) Прамая, на якой размешчаны цэнтры ўсіх пераламляльных і адбівальных паверхняў, што ўтвараюць аптычную сістэму (лінзавую, люстраную або люстранолінзавую). 3) Вось сіметрыі пераламляльных паверхняў лінзы або адбівальнай паверхні люстэрка; праходзіць праз цэнтры крывізны паверхняў перпендыкулярна да іх.

Схема **аптыметра** з праекцыйным адлікам: 1 — лямпа; 2 — пласціна са шкалой і індэксам; 3 — экран; 4 — праектавальныя люстэркі; 5 — рухомае люстэрка; 6 — нерухомае люстэрка; 7 — вымяральны стрыжань.

**АПТЫ́ЧНАЯ ІЗАМЕРЫ́Я**, энантыямерыя, з'ява, абумоўленая здольнасцю рэчыва вярцець у розныя бакі плоскасць палярызацыі святла, што праходзіць праз рэчыва; від *прасторавай ізамерыі*. Звязана з існаваннем рэчыва ў дзвюх формах (лева- і прававярчальнай), якія наз. аптычнымі ізамерамі або аптычнымі антыподамі і ўзнікаюць у выніку асіметрыі (хіральнасці) малекулы.

Аптычныя ізамеры адносяцца адзін да аднаго як несіметрычны прадмет і яго люстраны адбітак; маюць ідэнтычныя фіз. і хім. ўласцівасці, акрамя *аптычнай актыўнасці*. Адзін ізамер верціць плоскасць палярызацыі святла ўлева [l- ці (-)-форма], другі — управа [d- ці (+)-форма]. Дзве формы аднаго і таго ж рэчыва маюць люстрана процілеглыя *канфігурацыі*. Для вызначэння генетычнай сувязі рэчываў выкарыстоўваюць знакі L і D, якія сведчаць аб роднасці канфігурацыі аптычна актыўнага рэчыва з L- ці D-гліцэрынавым альдэгідам або адпаведна з L- ці D-глюкозай.




**Аптычная ізамерыя**: 1 — малочнай кіслаты, малекулы з асіметрычным атамам вугляроду; 2 — асіметрычных малекул: *а)* замяшчальных аленаў; *б)* спіранаў.

Аптычныя антыподы (ізамеры), узятыя ў эквімалекулярнай колькасці, утвараюць аптычна неактыўны *рацэмат*.

А.і. маюць прыродныя амінакіслоты, вугляводы, алкалоіды. Фізіял. і біяхім. дзеянне аптычных ізамераў рознае: бялкі, сінтэзаваныя з прававярчальных кіслот (прыродныя бялкі — левавярчальныя) не засвойваюцца арганізмам; левы нікацін больш ядавіты, чым правы. У біял. працэсах існуе феномен перавагі левай формы А.і., які ўплывае на ўяўленні аб шляхах зараджэння і эвалюцыі жыцця на Зямлі.

**АПТЫ́ЧНАЯ ЛАКА́ЦЫЯ**, выяўленне аддаленых аб'ектаў, вызначэнне іх месцазнаходжання, геам. памераў і скорасці руху з дапамогай эл.-магн. хваляў аптычнага дыяпазону ($10^{14}$—$10^{15}$ Гц). Бывае пасіўная (пры ўласным выпрамяненні аб'екта) і актыўная (лазерная;

пры адбіцці ад паверхні аб'екта выпрамянення лакацыйнай станцыі). Крыніца эл.-магн. выпрамянення для зандзіравання — *лазер*. А.л. адрозніваецца высокай раздзяляльнай здольнасцю (да доляў метра), высокай дакладнасцю ў вызначэнні вуглавых каардынатаў (да адзінак вуглавых секундаў) і скорасці аб'екта. Выкарыстоўваецца ў паветр. і касм. навігацыі, ваен. справе (навядзенне ракет, снарадаў), астраноміі (А.л. планет), для даследавання стану атмасферы, дакладнага картаграфавання паверхні Зямлі, Месяца і інш.

*Літ.*: Лазерная локация. М., 1984.

*Я.В.Алішаў.*

**АПТЫ́ЧНАЯ ПРЫЛА́ДА** вымяральная, прылада, прынцып дзеяння якой заснаваны на выкарыстанні эл.-магн. хваляў аптычнага дыяпазону. З дапамогай А.п. вымяраюць лінейныя і вуглавыя памеры, некаторыя фіз. велічыні, параўноўваюць форму вырабу ці стан апрацаваных паверхняў з эталонам. Адрозніваюць рабочыя (для практычных вымярэнняў) і ўзорныя, па якіх вывяраюць рабочыя А.п.







**Аптычная сувязь: часткі зямной паверхні (2 СС); усёй Зямлі (3 СС); НС — нізкалятаючы спадарожнік (200 км над Зямлёй); СС — сінхронны спадарожнік (36—40 тыс. км над Зямлёй).**

Асноўная частка А.п. — аптычная сістэма з лінзаў, люстэркаў, прызмаў і інш., прызначаных для ўтварэння відарысаў прадметаў на сятчатцы вока, экране і інш. або перадачы светлавой энергіі. Для іх разліку карыстаюцца формуламі геам. оптыкі. Канструкцыя прылады абумоўлена метадам вымярэнняў. Паводле прынцыпу дзеяння А.п. бываюць з аптычным візіраваннем і мех. (электронным або інш. неаптычным) адлікам перамяшчэння пунктаў кантакту з аб'ектам вымярэння (*праектары*, інстр. мікраскопы, праекцыйныя насадкі), аптычным візіраваннем і аптычным адлікам перамяшчэння (вымяральныя мікраскопы, інтэрферэнцыйныя кампаратары), з мех. кантактам з аб'ектам вымярэння і аптычным адлікам перамяшчэння (*аптыметры*, кантактныя *інтэрферометры*, аптычныя даўжынямеры). Выкарыстоўваюцца ў машына- і прыладабудаванні, геадэзіі і інш.

**АПТЫ́ЧНАЯ СІ́ЛА**, фізічная велічыня, якая характарызуе пераламляльную здольнасць аптычнай сістэмы. Абазначаецца D. А.с. лінзы $D = n/F$, дзе n — паказчык пераламлення асяроддзя, у якім знаходзіцца лінза, F — фокусная адлегласць. А.с. збіральных аптычных сістэм дадатная, рассейвальных — адмоўная. Для сістэмы з дзвюх лінзаў $D = D_1 + D_2 - dD_1D_2$, дзе d — адлегласць паміж заднім гал. фокусам першай лінзы і пярэднім гал. фокусам другой. Адзінка А.с. *дыяптрыя*.




**Асноўныя стадыі вырабу аптычнага дыска (арыгінала) і копіі з пастаяннай (несціральнай) сігналаграмай: *а* — зыходная дыскавая падложка; *б* — пасля нанясення на падложку слоя фотарэзісту 1; *в* — экспанаванне вярчальнага дыска факусіраваным лазерным выпрамяненнем 2; *г* — пасля праяўлення экспанаванага фотарэзісту; *д* — пасля металізацыі слоем серабра 3; *е* — пасля вырабу першага арыгінала металічнага дыска (звычайна нікелевага); *ж* — зыходная падложка дыска-копіі са штампам 4, вырабленым з металічнага дыска-арыгінала; *з* — пасля штампоўкі і наступнага пакрыцця падложкі дыска-копіі слоем металу 5 (звычайна алюмінію); *і* — пасля нанясення ахоўнага слоя 6 на металічны слой (гатовы дыск-копія).**

**АПТЫ́ЧНАЯ СУ́ВЯЗЬ**, перадача інфармацыі з дапамогай эл.-магн. хваляў аптычнага дыяпазону ($10^{14}$—$10^{15}$ Гц). Першая лінія аптычнага тэлеграфа пабудавана ў 1794 паміж Парыжам і Лілем (225 км). Стварэнне *лазераў*, святлодыёдаў, фотапрыёмнікаў, валаконна-аптычных кабеляў з надзвычай малымі стратамі дало магчымасць стварыць А.с., якая мае перавагу над інш. відамі сувязі па колькасці каналаў (вял. прапускная здольнасць), ахове ад перашкод, далёкасці і хуткасці перадачы, па эканоміі металу (мед і, алюмінію), па рэальнасці стварэння інтэгральных і інтэлектуальных сетак сувязі.

Для мадуляцыі лазернага выпрамянення ўздзейнічаюць на працэс яго генерацыі або выкарыстоўваюць мадулятар святла. На выхадзе перадатчыка фарміруецца вузкі маларазбежны прамень святла; трапляючы на ўваход прыёмніка, ён накіроўваецца на фотадэтэктар, дзе аптычнае выпрамяненне пераўтвараецца ў эл. сігнал, які ўзмацняецца і апрацоўваецца звычайнымі радыётэхн. метадамі.

Адрозніваюць А.с. з адкрытымі лініямі (для перадачы сігналаў праз атмасферу Зямлі ці касм. прастору) і з закрытымі святлаводнымі каналамі (валаконна-аптычныя лініі сувязі; выкарыстоўваюцца ў наземных і падводных умовах).

*Літ.*: Алишев Я.В. Многоканальные системы передачи оптического диапазона. Мн., 1986; Волоконно-оптические системы передачи. М., 1992.

*Я.В.Алішаў.*

**АПТЫ́ЧНАЯ ШЧЫ́ЛЬНАСЦЬ**, мера непразрыстасці слоя рэчыва для светлавых прамянёў. Характарызуе аслабленне аптычнага выпрамянення ў слаях рэчываў (фарбавальнікаў, святлафільтраў, раствораў і інш.). Для неадбівальнага слоя $D = \lg I_0/I = k_\lambda L$, дзе $I_0$, I — інтэнсіўнасць святла, што ўпала на слой і выйшла з яго адпаведна, $k_\lambda$ — каэфіцыент паглынання асяроддзя для выпрамянення з даўж. хвалі $\lambda$, L — таўшчыня слоя рэчыва. А.ш. звязана з каэфіцыентам прапускання $\tau$: $D = \lg 1/\tau$. Вымяраецца з дапамогай дэнсітометраў, мікрафатометраў, спектрасенсітометраў і інш. Выкарыстоўваецца ў фатаграфіі, астрафотаметрыі, пры аптычным гуказапісе, пры спектральнай аэрафотаздымцы і інш.

**АПТЫ́ЧНЫ ВІДАРЫ́С**, гл. *Відарыс аптычны*.

**АПТЫ́ЧНЫ ДАЛЬНАМЕ́Р**, *дальнамер* з візуальнай наводкай. Дзеянне заснавана на законах геам. оптыкі. Бываюць з пастаянным і пераменным паралактычным вуглом. Канструкцыйна могуць вырабляцца ў выглядзе самаст. прылад і насадак на зрокавыя трубы *тэадалітаў*.

**АПТЫ́ЧНЫ ДЫСК**, носьбіт інфармацыі ў выглядзе дыска, прызначаны для высакаякаснага запісу і ўзнаўлення гуку, відарыса, тэксту і інш. з дапамогай лазернага выпрамянення. Аснова А.д. — празрысты матэрыял (шкло, пластмаса і інш.), на які наносіцца рабочы слой, дзе пры лічбавым *аптычным запісе* ўтвараюцца мікраскапічныя паглыбленні (піты), што ў сукупнасці складаюць кальцавыя або спіральныя дарожкі. У параўнанні з традыц. сродкамі запісу і ўзнаўлення інфармацыі (мех., магн.) А.д. маюць больш высокую шчыльнасць запісу (да $10^8$ біт/см$^2$), большую даўгавечнасць носьбіта з-за адсутнасці мех. кантакту паміж ім і счытвальным прыстасаваннем, меншы час доступу да інфармацыі (да 0,1 с).

Рабочы слой А.д. для аднаразовага запісу і шматразовага ўзнаўлення — лёгкаплаўкая плёнка таўшч. да 0,03 мкм. Пад уздзеяннем лазернага выпрамянення ў працэсе запісу адбываецца лакальнае расплаўленне або выпарэнне

рабочага слоя. З такіх дыскаў з больш тоўстай плёнкай (да 0,15 мкм) робяць метал. матрыцу для стварэння дыскаў-копій (уласна А.д.) метадам прасавання або ліцця пад ціскам. Напр., на дыск дыяметрам 356 мм можна запісаць ТВ-праграму працягласцю да 2 гадз або стварыць пастаянную вонкавую памяць для ЭВМ аб'ёмам да 4 Гбайт, лічбавыя аптычныя грампласцінкі дыяметрам 120 мм (кампакт-дыскі) маюць працягласць гучання да 1 гадз. Кампакт-дыскі для пастаяннай вонкавай памяці ЭВМ змяшчаюць да 500 Мбайт інфармацыі. У рэверсіўных А.д., дзе шматразова (да $10^7$ цыклаў) ажыццяўляецца запіс — узнаўленне — сціранне інфармацыі, рабочы слой з паўправадніковых або магніта-аптычных матэрыялаў. Маюць дыяметр да 305 мм, аб'ём памяці да 2 Гбайт. Могуць замяняць стацыянарныя накапляльнікі ЭВМ вінчэстэрскага тыпу.

**АПТЫ́ЧНЫ ЗА́ПІС**, сістэма запісу і ўзнаўлення інфармацыі, заснаваная на выкарыстанні аптычнага выпрамянення. Пры запісе аптычнае выпрамяненне, мадуляванае сігналамі інфармацыі, што запісваецца, уздзейнічае на аптычны носьбіт даных (фотаплёнку, *аптычны дыск*, фотахромны матэрыял, феромагн. плёнку і інш.) і стварае ў ім устойлівыя лакальныя змены фіз. уласцівасцяў (каэф. адбіцця ці паглынання, колеру, намагнічанасці і г.д.), адпаведныя выходнаму сігналу. Пры ўзнаўленні адбываецца адваротны працэс: счытвальны прамень пры ўзаемадзеянні з носьбітам мадулюецца па інтэнсіўнасці і потым з яго вылучаюцца сігналы інфармацыі. Па спосабе запісу адрозніваюць сістэмы *фатаграфічнага запісу*, галаграфічнага (гл. *Галаграфія*), сістэмы з запісам на аптычных дысках і інш. Існуюць аналагавы А.з., пры якім фіксуюць усе значэнні ўваходнага сігналу ў пэўным дыяпазоне частот, і лічбавы, пры якім уваходныя сігналы падлягаюць квантаванню (дыскрэтызацыі), а затым пераўтвараюцца ў двайковыя лічбы для запісу на носьбіце (у выглядзе кода).

**АПТЫ́ЧНЫ КВА́НТАВЫ ГЕНЕРА́ТАР**, тое, што *лазер*.

**АПТЫ́ЧНЫ КВА́НТАВЫ ЎЗМАЦНЯ́ЛЬНІК**, узмацняльнік электрамагнітных хваляў аптычнага дыяпазону спектра, дзеянне якога заснавана на вымушаным выпрамяненні ўзбуджаных атамаў, малекул або іонаў. Першасная эл.-магн. хваля пры распаўсюджванні ў актыўным асяроддзі стымулюе вымушанае выпрамяненне, тоеснае з ёй па частаце, фазе, напрамку распаўсюджвання і характары палярызацыі. Для павелічэння каэфіцыента ўзмацнення актыўнае асяроддзе змяшчаюць у аб'ёмны рэзанатар. А.к.ў. мае малы ўзровень шумаў і высокую адчувальнасць. Выкарыстоўваецца ў выхадных каскадах магутных лазераў, сістэмах аптычнай і далёкай касм. сувязі, радыёастраноміі і інш. *В.В.Валяўка.*

**АПТЫ́ЧНЫ РЭЗАНА́ТАР**, сістэма люстраных адбівальных паверхняў, у якой узбуджаюцца і падтрымліваюцца стаячыя ці бягучыя электрамагнітныя хвалі аптычнага дыяпазону. У адрозненне ад *аб'ёмнага рэзанатара* аптычны з'яўляецца адкрытым (няма бакавых сценак). А.р. — адзін з важнейшых элементаў *лазера*. Асн. характарыстыка А.р. — *дыхтоўнасць* (вызначае страты светлавой энергіі і характарызуе рэзанансныя ўласцівасці).

Прасцейшы А.р. — інтэрферометр Фабры—Перо, які складаецца з 2 плоскіх строга паралельных люстэркаў, што знаходзяцца на адлегласці L, значна большай за даўжыню хвалі λ. Калі паміж люстэркамі ўздоўж восі рэзанатара распаўсюджваецца плоская светлавая хваля, то ў выніку адбіцця ад люстэркаў і інтэрферэнцыі адбітых хваляў утвараецца стаячая хваля. Умова рэзанансу: $L = q \cdot \lambda/2$, дзе q — падоўжны індэкс ваганняў (колькасць паўхваляў, што ўкладаюцца ўздоўж восі А.р.). У лазернай тэхніцы выкарыстоўваюцца канфакальныя рэзанатары, утвораныя сферычнымі люстэркамі, якія разнесены на адлегласць, роўную радыусу іх крывізны, а таксама кальцавыя А.р., што складаюцца з 3 і болей плоскіх або сферычных люстэркаў. У А.р. са сферычнымі люстэркамі ўзбуджаюцца




Схема **аптычнага рэзанатара**.




Віды **аптычных рэзанатараў**: 1 — плоскі лінейны; 2 — сферычны лінейны; 3 — плоскі кальцавы; 4 — сферычны кальцавы.

таксама незалежныя бягучыя насустрач адна адной хвалі.

*Літ.:* Ананьев Ю.А. Оптические резонаторы и проблема расходимости лазерного излучения. М., 1979. *В.В.Валяўка.*

**АПТЫ́ЧНЫЯ З'Я́ВЫ Ў АТМАСФЕ́РЫ**, светлавыя з'явы, звязаныя з праходжаннем у зямной атмасферы прамянёў Сонца і інш. свяціл або штучных крыніц святла. Выкліканы пераламленнем (*міражы*, мігаценне зорак і інш.), рассеяннем, адбіццём, інтэрферэнцыяй і дыфракцыяй святла на малекулах паветра і слаях рознай шчыльнасці (блакітны колер неба, *золак*, змярканне), аэразолях — кроплях вады, крышталях лёду (*гала*, вянцы, *вясёлка*, *глорыя*). Назіранні за А.з. ў а. вядуцца на метэастанцыях. Па гэтых з'явах можна меркаваць аб стане некаторых слаёў атмасферы і выкарыстоўваць іх як мясцовыя прыкметы надвор'я. *М.А.Гольберг.*

**АПТЭ́КА** (ад грэч. apothēkē склад, кладоўка), медыцынская ўстанова, дзе рыхтуюць, захоўваюць і адпускаюць лякарствы, прадметы санітарыі, гігіены і інш. тавары мед. прызначэння. Папярэднічалі А. лабараторыі для прыгатавання лекаў у краінах стараж. свету (Кітай, Егіпет, Рым). Як установы з дзярж. рэгламентацыяй дзейнасці А. ўзніклі ў Багдадзе ў 8 ст., у Расіі — у 16 ст. (падпарадкоўваліся Аптэкарскаму прыказу). На Беларусі першыя А. з'явіліся ў Пінску (1561), Брэсце (1566). У 16—18 ст. іх было больш за 30, у 1-й пал. 19 ст. — каля 70 прыватных і 15 казённых, у 1913 — 297. На пач. 1994 дзейнічалі каля 1200 А., пачала фарміравацца сетка А. недзярж. формаў уласнасці. Пераважная іх большасць — дзярж. гасп.-разліковыя А. (у зах. краінах пераважаюць прыватна-прадпрымальніцкія); існуюць А. самастойныя (у т.л. цэнтр., раённыя), пры лячэбна-прафілакт. установах, бальнічных стацыянарах і г.д.

Асн. функцыя А. — забеспячэнне насельніцтва лек. сродкамі і мед. таварамі — спалучаецца з вытв. (выраб, прыгатаванне і расфасоўка лекаў непасрэдна ў А., арганізацыя нарыхтовак і закупак лек. сыравіны ў насельніцтва), інфарм.-асветнай (звесткі аб наяўнасці прэпаратаў і іх заменнікаў, пашырэнне ведаў па санітарыі, гігіене, фармацыі, умовах захоўвання лекаў і інш.), фін. і гасп. дзейнасцю. Усім А. устанаўліваецца адзіны парадак захоўвання і рэалізацыі лек. сродкаў, даводзіцца пералік прэпаратаў, на атрыманне якіх патрэбны спец. дазвол (напр. наркатычныя сродкі). Заканадаўствам Беларусі прадугледжаны льготныя формы абслугоўвання некаторых катэгорый насельніцтва.

*Л.П.Ражкіна.*

**АПТЭ́КАРСКАЯ ВАГА́**, сістэма мер (адзінак) масы для ўзважвання лекаў. Асн. адзінка — аптэкарскі *фунт*, які падзяляўся на 12 унцый, унцыя — на 8 драхмаў, драхма — на 3 скрупулы, скрупул на 20 гранаў. У 19 і пач. 20 ст. на Беларусі карысталіся А.в.: 1 рус. аптэкарскі фунт = 358,323 г, 1 унцыя = = 29,860 г, 1 драхма = 3,732 г, 1 скрупул = 1,244 г, 1 гран = 62,209 г. У англ. сістэме мер гэтыя адзінкі маюць інш. значэнні.

**АПТЭРЫГО́ТЫ** (Apterygota), гл. *Бяскрылыя насякомыя*.

**АПТЭРЫЁЗ** (ад *a*... + грэч. pteron пяро + *...оз*), хвароба птушак, якая характарызуецца затрымкай або поўным прыпыненнем росту пер'я. Часцей сустракаецца ў маладняку вадаплаўнай птушкі пры антысанітарным утрыманні, адсутнасці водных выгулаў, недахопе ў рацыёне амінакіслот (цыстыну, лізіну, метыяніну). Пры А. прыпыняецца функцыя хвастцовай залозы, намакае покрыўнае пер'е, зніжаецца імунна-біял. рэактыўнасць арганізма, у выніку ўзнікаюць дэрматозы скуры і прастудныя захворванні.

**АПУ́КА**, бел. нар. гульня. Гуляюць 2 каманды. Кожная выбірае вядучага. На пляцоўцы паміж камандамі праводзяць 2 лініі на адлегласці 30—40 м. Удзельнікі каманды «горада» па чарзе бітай кідаюць апуку (мяч памерам з тэніскны) у бок праціўніка (у «поле»). Калі гульцы «палявой» каманды зловяць мяч з лёту, каманды мяняюцца месцамі. Калі мяч не злоўлены, «палявыя» гульцы падхопліваюць яго і ад сваёй лініі кідаюць у гульца «гарадской» каманды, які ў гэты час павінен дабегчы да чужой лініі і вярнуцца да сваіх; калі мяч пападзе ў гульца, каманды таксама мяняюцца месцамі. Лакальныя назвы перагон, салавей, ілкі, лавец і інш.

Беларуская народная гульня апука.

**АПУКО́ВА**, возера ў Беларусі, у Гарадоцкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Обаль. За 34 км на ПнЗ ад г. Гарадок.

Пл. 0,28 км$^2$, даўж. 1 км, найб. шыр. 0,35 км. Пл. вадазбору 4,25 км$^2$. Берагі нізкія, паўд.-ўсх. забалочаныя. Схілы катлавіны выш. да 25 м, зарослыя хмызняком. Востраў пл. 0,7 га.

**АПУЛЕ́Й** (Apuleius) Луцый (каля 125, г. Мадаўра, Паўн. Афрыка — каля 180), старажытнарымскі пісьменнік, аратар. Адукацыю атрымаў у Карфагене і Афінах. З яго літ. спадчыны дайшла невял. частка: авантурна-алегарычны раман «Метамарфозы» («Залаты асёл») у 11 кнігах з устаўнымі навеламі (у т.л. казка пра Амура і Псіхею, кн. 4—6), у якім рэаліст. і сатыр. малюнкі з жыцця рымскай правінцыі 2 ст. н.э. спалучаюцца з эротыкай, фантастыкай і містыкай, — адзін з першых псіхал. раманаў у еўрап. л-ры; «Апалогія, ці Слова ў абарону супраць абвінавачання ў магіі»; зб. урыўкаў з рытарычных прамоў А. «Фларыды»; навукова-філас. трактаты і інш. На бел. мову «Метамарфозы» пераклаў П.Бітэль.

*Тв.*: Бел. пер. — Метамарфозы, ці Залаты асёл // Лонг. Пастушыная гісторыя пра Дафніса і Хлою...: Раманы. Мн., 1991; Рус. пер. — «Метаморфозы» (и другие сочинения): Пер. с лат. М., 1988.

**АПУЛЕ́Й САТУРНІ́Н** Луцый (Lucius Apuleius Saturninus; ? — 100 да н.э.), рымскі паліт. дзеяч, *папуляр*. Нар. трыбун. У 104 — квестар, кіраваў у Остыі ўвозам хлеба. У 101 выступіў з выкрыццём сенатараў, падкупленых пасламі цара Пантыйскай дзяржавы *Мітрыдата VI Еўпатара*. Правёў праз нар. сход законы аб надзяленні зямлёй ветэранаў *Марыя* і вывядзенні калоній у правінцыі. Забіты прыхільнікамі *аптыматаў*.

**АПУ́ЛІЯ** (Puglia), вобласць на ПдУ Італіі. Пл. 19,4 тыс. км$^2$, нас. 4,1 млн. чал. (1990). Уключае правінцыі: Бары, Брындызі, Лечэ, Таранта, Фоджа. Адм. ц. — г. Бары. Буйныя гарады: Брындызі, Таранта, Фоджа. Адгор'і Апенін на З (1151 м, г. Даўнія); масіў Гаргана (да 1056 м) і плато Ле-Мурджэ акаймаваны вузкай прыбярэжнай нізінай каля Адрыятычнага м., паўд. ч. п-ва Саленціна раўнінная. Клімат міжземнаморскі, ападкаў 400—500 мм за год. Аснова эканомікі — сельская гаспадарка. Вырошчваюць вінаград, масліны, садавіну, лён, тытунь, збожжа, бавоўнік, цукр. буракі, агародніну. Авечкагадоўля. Рыбалоўства. Перапрацоўка с.-г. прадукцыі — вінаробчая, мукамольная, тытунёвая прам-сць, выраб аліўкавага алею. Нафтаперапрацоўка, нафтахім., металургічная, с.-г. машынабудаванне, суднабудаванне, швейная, тэкст., гумавая прам-сць. Здабыча баксітаў, прыроднага газу, каменнай солі. Транспарт чыг., аўтамаб., марскі.

Ілюстрацыя М.Селешчука да рамана Апулея «Залаты асёл». Мінск. 1991.

**АПУ́НЦЫЯ** (Opuntia), род кветкавых раслін сям. кактусавых. Каля 300 відаў. Пашыраны ад стэпавай зоны Канады да Паўд. Аргенціны (за выключэннем вільготных трапічных абласцей). На Беларусі асобныя віды вырошчваюць у пакаёвай культуры і аранжарэях. Найб. дэкар. А. белаватая (O. leucotricha) і дробнаваласістая (O. microdasys). У пакоях цвітуць рэдка. Размнажэнне чаранкамі.

Сукулентныя шматгадовыя расліны. Сцябло падзелена на членікі, з калючкамі або без іх, паводле формы членікаў бывае шарападобнае, цыліндрычнае і плоскае (найб. пашырана). Лісце невялікае, шылападобнае, сакаўное, рана ападае. Кветкі адзіночныя, двухполыя. Плады ягадападобныя, мякаць сцябла і лісця ў большасці відаў ядомыя; іх выкарыстоўваюць у харч. і спіртавой прам-сці, медыцыне, як корм, фарбавальны сродак, з валокнаў вырабляюць паперу. Расліны прыдатныя на жывыя агароджы, сідэрат і паліва.

**АПУРЫ́МАК** (Apurimac; у ніжнім цячэнні Э н е, Т а м б а), рака ў Перу, левы прыток р. Укаялі (сістэма Амазонкі). Даўж. 1250 км, пл. бас. каля 125 тыс. км$^2$. Пачынаецца на ўсх. схіле Зах. Кардыльеры (на ПнЗ ад воз. Тытыкака), цячэ на ПнЗ у глыбокіх і вузкіх далінах, якія расчляняюць Анды. Паўнаводная летам (снеж. — лютым). Сярэдні расход вады 2,9 тыс. м$^3$/с. Вельмі парожыстая. На А. горад Пуэрта-Прада.

**АПУ́РЭ** (Apure), рака ў Венесуэле, левы прыток р. Арынока. Даўж. 1580 км, пл. бас. 147 тыс. км$^2$. Пачынаецца з Кардыльеры-дэ-Мерыда, цячэ з З на У па раўнінах Льянас-Арынока, упадае ў Арынока некалькімі рукавамі. Паўнаводная ў перыяд дажджоў (з мая да лістапада). Бурныя паводкі. Сярэдні расход вады каля 2 тыс. м$^3$/с. Суднаходная на 600 км, у перыяд дажджоў — на ўсім працягу. На А. гарады Брусуаль, Сан-Фернанда-да-Апурэ.

**АПУСКНЫ́ КАЛО́ДЗЕЖ**, полая замкнёная звычайна жалезабетонная канструкцыя, якая апускаецца ў грунт ад уласнай вагі і агароджвае грунтавую выпрацоўку. Бывае круглай (дыяметрам да 80 м), эліптычнай ці прамавугольнай у плане формы. Грунт унутры А.к. распрацоўваецца пераважна грэйферам, таксама экскаватарам, гідраэлеватарам. У малазвязных грунтах і пясках апус-

канне калодзежа паскараюць вібраўстаноўкамі, у гліністых — напампоўваннем паміж сценкамі калодзежа і грунтам гліністай суспензіі. Выкарыстоўваюцца А.к. пры збудаванні глыбокіх масіўных фундаментаў (70 м і болей), падземных памяшканняў, рэзервуараў і інш. Калі А.к. прызначаецца пад фундамент, то запаўняецца бетонам ці замуроўваецца, калі пад памяшканне (напр., помпавую станцыю) — робіцца днішча.

**АПУСТЫ́ІНЬВАННЕ**, страта мясцовасцю суцэльнай расліннасці пры немагчымасці яе ўзнаўлення без удзелу чалавека. Адбываецца ў выніку прыродных змен, часцей у выніку *антрапагеннага ўздзеяння* на прыроду: высечка лясоў у сумежных з пустынямі рэгіёнах і празмерны выпас жывёлы. Назіраецца ў засушлівых (не абавязкова гарачых) абласцях.

Адрозніваюць 2 формы А.: дэзертыфікацыю — пашырэнне арэала пустыні — і дэзертызацыю — паглыбленне працэсаў А. на месцы. Агульная плошча пустыняў і паўпустыняў свету складае каля 43% усёй сушы, плошча антрапагенных — каля 6,7%. Мяркуюць, што працэс А. ідзе са скорасцю 7—24 км$^2$ у гадзіну. Пад пагрозай А. знаходзіцца яшчэ 30 млн. км$^2$ — 19% сушы.

**АПУ́ХЦІН** Аляксей Мікалаевіч (27.11.1840, г. Болхаў Арлоўскай вобл. — 29.7.1893), рускі паэт, празаік. Аўтар цыклаў вершаў «Вясковыя нарысы» (1859), «Вясенніе песні» (1860), паэмы «Год у манастыры» (1855), зб. вершаў (1886). Асн. матывы лірыкі — сум, расчараванне, незадаволенасць жыццём. Многія вершы пакладзены на музыку П.Чайкоўскім і інш. кампазітарамі. У празаічных творах, напісаных у форме лістоў, дзённікаў («Архіў графіні Д**», 1890; «Дзённік Паўліка Дольскага», 1891: усе апубл. пасмяротна), намаляваў побыт пецярбургскага грамадства 1880-х г.

*Тв.*: Соч.: Стихотворения; Проза. М., 1985.

**АПЦЫЁН** [ням. Option ад лац. optio (optionis) выбар], 1) у міжнародным праве выбар асобай грамадзянства (гл. *Аптацыя*). 2) У аўтарскім праве А. выкарыстоўваецца пры заключэнні дагавораў пра выданне твораў аўтара адной дзяржавы ў інш. дзяржаве. Выд-ва пасля пагаднення пра А. з замежным аўтарам вывучае твор і вырашае пытанне пра магчымасць яго выдання. Канчатковы адказ выд-ва дае ва ўстаноўлены тэрмін, да заканчэння якога аўтар не можа заключыць дагавор з інш. выд-вамі аб выданні твора на той жа мове. Ніякіх плацяжоў пагадненне пра А. не прадугледжвае. 3) Агаворка ў дагаворы марской перавозкі аб праве замены аднаго грузу або аднаго порта назначэння іншым. 4) Прывілей на біржах, які даецца пры выплаце пэўнай прэміі на атрыманне тавару па раней устаноўленай цане на працягу пэўнага тэрміну.

**АПШЭРО́НСКАЕ МО́РА**, саленаватаводны басейн, які існаваў на пачатку антрапагенавага перыяду (у апшэронскі век) на месцы Каспійскага м. і прылеглых нізін. Займала меншую плошчу, чым папярэдняе *Акчагыльскае мора*. Намнажаліся пяскі, гліны, мергелі, вапнякі. Адносяць да *эаплейстацэну* (каля 1,65—0,8 млн. г. назад).

**АПШЭРО́НСКІ ПАЎВО́СТРАЎ**, на зах. беразе Каспійскага м., у Азербайджане. Даўж. да 60 км, шыр. да 30 км. Усх. канцавая частка п-ва — Шахава каса. Хвалістая раўніна (выш. да 165 м) з грязевымі сопкамі і бяссцёкавымі катлавінамі, запоўненымі саланчакамі і салёнымі азёрамі, месцамі ўчасткі рухомых пяскоў. Радовішчы нафты і газу (гл. *Бакінскі нафтагазаносны раён*). Мінер. крыніцы. Пустынны клімат змякчаецца ўплывам мора. Расліннасць паўпустынная. Вінаграднікі і бахчавыя культуры на паліўных землях. Кліматычныя і бальнеалагічныя курорты. На паўд. ўзбярэжжы паўвострава г. Баку.

Апунцыя ў пакаёвай культуры.



**Апускны калодзеж**: 1 — цалкам запоўнены бетонам (калодзеж-апора); 2 — часткова запоўнены бетонам (калодзеж — заглыбленае збудаванне).



Выманне грунту з апускнога калодзежа грэйферам.

**АПЫЛЕ́ННЕ**, перанос пылку на рыльца песціка (у *пакрытанасенных*) або на семязавязь (у *голанасенных*) раслін. Папярэднічае *апладненню*. Адрозніваюць 2 біял. тыпы А.: самаапыленне (перанос пылку ў межах адной кветкі — аўтагамія або з інш. кветак той жа расліны — гейтанагамія) і перакрыжаванае (перанос пылку з кветак інш. раслін). Самаапыленне менш пашырана, трапляецца ў некаторых дзікарослых (напр., дзьмухавец, ястрабок) і культурных (ячмень, пшаніца, гарох, фасоля) раслін; у некаторых відаў адбываецца ў нераскрытых кветках (*клейстагамія*). Перакрыжаванае А. больш прагрэсіўнае (аб'ядноўваюцца розныя геномы, у выніку ўтвараецца гетэразіготнае, больш жыццяздольнае патомства). Пылок можа пераносіцца ветрам (*анемафілія*), вадой (*гідрафілія*), насякомымі (*энтамафілія*), птушкамі (арнітафілія) і інш. У селекцыі і раслінаводстве шырока выкарыстоўваюць штучнае А.

Навясны універсальны апырсквальнік ОН-400.




**Прынцыповая схема апырсквальніка ОПШ-15М**: *Б1, Б2* — бакі асноўны і дадатковы; *П* — помпа; *РЦ* — рэгулятар ціску напорнай магістралі; *МН* — манометр; *К1, К2* — калектары напорны і зліўны; *Ф1, Ф2, Ф3* — фільтры; *В1, В2, В3* — вентылі; *УМ* — узроўнямеры; *КМ1, КМ2* — краны; *Р* — рукавік мяшалкі; *Э1, Э2* — эжэктары; *СЦ, СПР1, СПР2, СК1, СК2* — цэнтральная, прамежкавыя і крайнія секцыі штангі; *РВ* — распыляльнік; *ВП* — выканаўчае прыстасаванне; *ДС* — датчык скорасці; *РМ* — расходамер; *БК* — блок кіравання.

**АПЫЛЕ́ННЕ НАСЯКО́МЫМІ**, гл. *Энтамафілія*.

**АПЫ́РСКВАЛЬНІК**, машына для апырсквання раслін растворамі, суспен-

зіямі ці эмульсіямі ядахімікатаў. Выкарыстоўваюць для барацьбы з пустазеллем, шкоднікамі і хваробамі, пры дэфаліяцыі і дэзінсекцыі памяшканняў. Бываюць самалётныя, трактарныя (прычапныя і навясныя) і ранцавыя; гідраўлічныя і вентылятарныя.

У гідраўлічных А. рабочая вадкасць распыльваецца фарсункамі за кошт лішкавага ціску ў гідрасістэмах. У вентылятарных вадкасць распыльваецца, акрамя фарсунак, паветраным патокам ад вентылятара. На Беларусі асвойваецца вытв-сць гідраўлічных А. (ОПШ-15М) з дадатковым абсталяваннем для прыгатавання растворaў пестыцыдаў непасрэдна ў А. *Л.Я.Сцяпук.*

**АПЫТА́ННЕ**, метад збору пачатковай інфармацыі для сацыялагічных, эканам., псіхал. і інш. даследаванняў ад пэўнай сукупнасці людзей (рэспандэнтаў). Мэта А. — атрыманне інфармацыі пра аб'ектыўныя (падзеі, працэсы) або суб'ектыўныя (меркаванні, погляды, настроі) з'явы. Як метад сацыяльнага даследавання ўзнікла ў 19 ст. Упершыню праведзена ў 1824 у ЗША. Адрозніваюць А. пісьмовыя (*анкетаванне*) і вусныя (*інтэрв'ю*), экспертныя і масавыя, вочныя і завочныя (паштовыя, тэлефонныя), аднаразовыя і шматразовыя, выбарачныя і суцэльныя (*рэферэндумы*) і інш. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь прадугледжвае выкарыстанне А. ў форме рэферэндумаў для вырашэння найважнейшых пытанняў дзярж. і грамадскага жыцця. Масавыя А. разам з пазнавальнай выконваюць функцыю дэмакратызацыі грамадства. Тэрмін «А.» абазначае таксама элементы збору любой інфармацыі, носьбітам якой з'яўляецца чалавек (А. пацыентаў у мед. установе, студэнтаў на экзамене і інш.). *С.А.Яцкевіч.*

**АПЯКУ́Н**, гл. ў арт. *Апека.*

**АПЯРА́ЗВАЛЬНЫ ЛІША́Й**, апяразвальны герпес, вострая інфекцыйная хвароба з пашкоджаннем нерв. сістэмы і скуры; узнікае ад віруса ветранай воспы. Бывае ў выглядзе спарадычных адзінкавых выпадкаў пераважна вясной і восенню ў дарослых (дзеці да 10 гадоў хварэюць рэдка). Прыкметы захворвання: ліхаманка, боль, пачуццё паколвання, свербу ў вобласці адчувальных нерваў (пераважна міжрэберных і трайчастага на твары). Потым узнікаюць ружовыя плямы (3—5 см і болей), на якіх праз 1—2 сут з'яўляюцца дробныя шматлікія пухіры. Праз 6—8 сут на месцы пухіроў утвараюцца скарыначкі, якія праз 3 тыдні адпадаюць, застаецца пігментацыя. Бываюць атыпічныя формы А.л.: абартыўная (без высыпкі), генералізаваная (шматлікія пухіры на целе), булёзная (зліццё дробных пухіроў), гемарагічная (крывяністы пухіры), гангрэнозная (найбольш цяжкая — на месцы пухіроў узнікае некроз тканкі, потым рубцы). У некаторых выпадках пры А.л. пашкоджваюцца нервы (напр., нервы твару), галаўны мозг і яго абалонкі — менінгаэнцэфаліт. Лячэнне: тэрапеўтычнае і фізіятэрапеўтычнае.

**АПЯРЭ́ННЕ** самалёта, аэрадынамічныя паверхні, прызначаныя для забеспячэння ўстойлівасці і кіроўнасці самалёта. Бывае вертыкальнае (нерухомы кіль з рухомым рулём напрамку) і гарызантальнае (нерухомы ці рухомы *стабілізатар* з рухомым рулём вышыні або рухомы стабілізатар без руля). Асн. тыпы А.: аднакілевае з ніжнім размяшчэннем гарыз. апярэння (звычайнае), Т- і V-падобнае, двухкілевае. Звычайна А. размяшчаюць на хваставой частцы *фюзеляжа*. Ёсць таксама самалёты толькі з верт. апярэннем на канцах крыла, з гарыз. на пярэдняй частцы фюзеляжа і інш.



Апярэнне самалёта: *а* — звычайнае; *б* — Т-падобнае; *в* —двухкілевае; 1 — стабілізатар; 2 — руль вышыні; 3 — кіль; 4 — руль напрамку.

**АР** (ад лац. area плошча), пазасістэмная адзінка плошчы ў метрычнай сістэме мер. Роўны плошчы квадрата са старанай 10 м. Абазначаецца ар. 1 ар = 100 м$^2$. На Беларусі наз. соткай.

**А́РА**, агульная назва 2 родаў (Ara і Anadorhynchus) клінахвостых папугаяў атр. папугаепадобных. 18 відаў. Жывуць у лясах Паўн. і Паўд. Амерыкі. Як дэкар. птушкі завезены ў многія краіны свету. Найб. вядомыя А. чырвоны (Ara macao), А. блакітны (Ara ararauna), А. гіяцынтавы (Anadorhynchus hiacinthinus).

Гіяцынтавы А. даўж. да 1 м. Ярка афарбаваныя птушкі з доўгім хвастом. Дзюба моцная. Чароды А. часам шкодзяць пладовым дрэвам. Лёгка прыручаюцца і могуць «гаварыць». Некаторыя ахоўваюцца. Трохкаляровы А. вымер на Кубе ў 1880-я г.

**АРА́**, гл. *Амерыканская адміністрацыя дапамогі.*

**АРА́ ГЕХЕЦЫ́К**, Ара Прыгожы, у армянскім эпасе бог, які памірае і ўваскрасае, сын *Арама*, цар армянскай дзяржавы. Паводле міфаў, адмовіўся стаць мужам ці каханкам багіні кахання, царыцы Асірыі Шамірам, за што тая пайшла вайной на Арменію. А.Г. загінуў у баі, але па загадзе Шамірам аралезы (духі) ажывілі яго. Імем А.Г. назв. Араратская раўніна, гара Цахкеванк (другая яе назва Ара).

**АРА́БА-АФРЫКА́НСКІ МІЖНАРО́ДНЫ БАНК** (Arab-African International Bank; ААМБ), міжнародная фінансавая акцыянерная камерцыйная ўстанова. Засн. ў 1964 як Араба-Афрыканскі банк. Акцыянеры ААМБ: Егіпет, Алжыр, Ірак, Іарданія, Кувейт, Катар, а таксама 2 камерцыйныя банкі — Саюз арабскіх і франц. банкаў (Францыя) і Араба-Афрыканскі банк (Маўрытанія). Месца знаходжання — Каір. ААМБ мае на мэце стаць магутным фін. ін-там на Б. Усходзе і ў Паўн. Афрыцы, здольным пацясніць пазіцыі банкаўскіх устаноў зах. краін.

**АРА́БА-ІЗРАІ́ЛЬСКАЯ ВАЙНА́ 1948—49**, Палесцінская вайна, вайна паміж араб. краінамі (Іарданія, Егіпет, Ірак, Сірыя, Ліван) і Ізраілем у маі 1948 — студз. 1949. Звязана з вырашэннем палесцінскага пытання. Рэзалюцыя Ген. Асамблеі ААН ад 29.11.1947 прадугледжвала стварэнне на тэр. Палесціны араб. (11,1 тыс. км$^2$) і яўр. (14 тыс. км$^2$) дзяржаў. Вялікабрытанія 14.5.1948 адмовілася ад мандата на Палесціну, а Ізраіль абвясціў сваю незалежнасць. 15.5.1948 сем араб. краін (у т.л. Саудаўская Аравія і Емен, хоць яны не ваявалі) абвясцілі Ізраілю вайну. У ходзе баявых дзеянняў араб. часці (30 тыс. чал.) заваявалі шэраг населеных пунктаў Ізраіля і наблізіліся да Іерусаліма і Тэль-Авіва. Па рэкамендацыі Савета Бяспекі ААН 11 чэрв. падпісана перамір'е. Ізраіль пасля закупак зброі і баявой тэхнікі за мяжой, прыбыцця новых імігрантаў павялічыў армію з 67 да 120 тыс. чал. 15.10.1948 ён аднавіў ваен. дзеянні і на працягу 2 месяцаў перанёс баі на тэр. Егіпта і Лівана. Пад націскам Вялікабрытаніі кароль Егіпта Фарук пагадзіўся на перамір'е. 7.1.1949 баявыя дзеянні спынены, у лют.—ліп. 1949 заключана перамір'е. У выніку вайны Ізраіль заняў дадаткова 6,7 тыс. км$^2$ араб. зямель і зах. ч. Іерусаліма. Гэтыя землі вымушаны былі пакінуць 900 тыс. арабаў. Зах. бераг р. Іардан і ўсх. ч. Іерусаліма засталіся пад уладай Іарданіі, а сектар Газа — Егіпта.

**АРА́БА - ЛАЦІНААМЕРЫКА́НСКІ БАНК** (Arab-Latin American Bank; АРЛАБАНК), міжнародная фін. аргані-

зацыя. Створаны ў 1977. Члены — 25 банкаў, фін. кампаній і міжнар. фін. ін-таў. Штаб-кватэра ў Ліме (Перу). Мэта: пашырэнне і паглыбленне супрацоўніцтва арабскіх і лацінаамерыканскіх краін у галіне эканомікі і фінансаў; фінансаванне праектаў эканам. развіцця краін Лац. Амерыкі.

**АРАБА́ЦКАЯ СТРО́ЛКА**, вузкая і доўгая пясчаная каса ва ўсх. ч. Крымскага п-ва. Цягнецца амаль паралельна паўн.-ўсх. берагу і аддзяляе зал. Сіваш ад Азоўскага мора. Даўж. 113 км, шыр. ад 270 м да 8 км. На Пн аддзяляецца ад мацерыка вузкім Генічаскім пралівам. Назва паходзіць ад стараж. ўмацавання Арабат.

**АРАБЕ́Й** Лідзія Львоўна (н. 27.6.1925, в. Нізок Уздзенскага р-на Мінскай вобл.), бел. пісьменніца. Канд. філал. н. (1958). Скончыла БДУ (1951). Працавала ў рэдакцыях час. «Вожык», «Полымя», газ. «Чырвоная змена», выд-ве «Беларусь». Друкуецца з 1946. Аўтар манаграфій «Цётка (Алаіза Пашкевіч)» (1956) і «Хвядос Шынклер» (1959), твораў для дзяцей (зб. апавяданняў «Калібры», 1960, аповесць «Сіні бор», 1972; зб. апавяданняў і казак «Ісці ў разведку», 1989). Пра жыццё і творчасць Цёткі аповесці «На струнах буры» (1966) і «Стану песняй» (1977). Актуальныя праблемы сучаснасці ў аповесцях «Мера часу» (1962), «Экзамен» (1963), «Ваўчкі» (1972). Айч. вайна — гал. тэма аповесцяў «На другой зіме вайны» (1966) і «Сярод ночы» (1968), раманаў «Іскры ў папялішчы» (1969), «Сузор'е Вялікай Мядзведзіцы» (1980), зб. прозы «Мне трэба ехаць» (1974).

*Тв.*: Выбр. творы. Т. 1—2. Мн., 1985; Халодны май. Мн., 1993.

**АРАБЕ́ЙКА** Іван Сяргеевіч (н. 26.3.1942, в. Хмелева Жабінкаўскага р-на Брэсцкай вобл.), бел. паэт. Скончыў БПІ (1964), Вышэйшыя літ. курсы ў Маскве (1983). З 1975 працуе ў Брэсцкім аддз. Гандлёва-прамысл. палаты Беларусі. Вершы А. (зб-кі «Услед за сонцам», 1972; «Асенні ранак», 1978) вызначаюцца навізной рабочай тэматыкі, адлюстроўваюць працоўныя будні. У паэме «Сцяна» (1975) уславіў подзвіг абаронцаў Брэсцкай крэпасці.

**АРАБЕ́СК** (франц. arabesque ад італьян. arabesco арабскі), адна з асноўных позаў класічнага танца. Цела абапіраецца на прамую нагу, другая паднята і выцягнута назад; адна рука выцягнута ўперад, другая адведзена ўбок ці назад, корпус нахілены ўперад. У сучасным балеце сустракаюцца шматлікія формы А. пры розных становішчах апорнай нагі, рук, галавы, корпуса.

**АРАБЕ́СКА**, жанр інструментальнай музыкі (гал. чынам для фп.); муз. п'еса звычайна вытанчанага характару, з багата арнаментаваным меладычным малюнкам і ўзорыстай фактурай. А. пісалі Р.Шуман (першы ўзор), А.Лядаў, К.Дэбюсі і інш.

**АРАБЕ́СКІ**, складаны, насычаны *арнамент*, заснаваны на мудрагелістым перапляценні геам. і стылізаваных раслінных матываў; часам уключае і надпісы. Развіўся ў пластычных мастацтвах арабскіх краін. У эпоху Адраджэння ў Еўропе А. наз. любы арнамент, які складаўся з пераплеценых ліній, стужак ці галінак. У бел. мастацтве А. захаваліся ў аздобе драўляных царскіх варот Благавешчанскай царквы Супрасльскага манастыра (16 ст.), у гравіраваным дэкоры шклянога посуду мануфактур Урэчча і Налібакаў (18 ст.), каваных алтарных перагародак (Троіцкі касцёл у Ружанах Пружанскага р-на, 18 ст.), каваных дзвярах бернардзінскага касцёла ў Гродне (17 ст.) і інш. А. былі ўпрыгожаны шпалеры, што аздаблялі сцены гар. палаца Радзівілаў у Нясвіжы ў 18 ст., дываны Гродзенскай ткацкай мануфактуры. *М.М.Яніцкая.*

Ара: 1 — чырвоны; 2 — гіяцынтавы; 3 — блакітны (сіне-жоўты).

**АРАБІ́ЗМ**, слова, запазычанае з дыялектаў арабскіх народаў і літаратурнай арабскай мовы. Невялікі пласт А. вядомы ў старабел. мове 16—17 ст., куды яны трапілі пераважна праз пасрэдніцтва цюркскіх моў у выніку ваен. і эканам. зносін славян з цюркамі: «атлас» (шаўковая тканіна), «мула» (у форме «молла»), «кайданы», «каран», «султан» і інш. Некаторыя А. ўвайшлі ў мовы многіх народаў свету: «алкаголь», «іслам», «мумія», «халіф» і інш. У наш час А. трапляюцца пераважна ў перакладах з арабскай мовы. *А.І.Жураўскі.*

**АРА́БІ-ПАША́**, Урабі-паша Ахмед (1839—21.9.1911), адзін з кіраўнікоў нац.-вызв. руху ў Егіпце ў 1879—82. Палкоўнік. У вер. 1881 узначаліў паўстанне каірскага гарнізона, у выніку якога створаны егіп. нац. ўрад. Ваенны міністр. У час *англа-егіпецкай вайны 1882* кіраваў егіп. арміяй супраць англ. інтэрвенцыі. Пасля паражэння (снеж. 1882) прыгавораны да пакарання смерцю (заменена пажыццёвай ссылкай на в-аў Цэйлон). У 1901 памілаваны.

Арабеска.

**АРАБІ́СТЫКА**, комплекс гуманітарных навук, што вывучаюць гісторыю, мову, літаратуру і культуру араб. краін і народаў. Ва ўсх. краінах А. зарадзілася ў 8 ст., у Зах. Еўропе ў 16 ст. ў перыяд актывізацыі гандл. і дыпламат. адносін з Усходам і пранікнення ў гэтыя рэгіёны місіянераў Ватыкана. У 17—18 ст. цэнтрамі А. сталі Рым, Парыж, Лейдэн.

Ням. арабіст 18 ст. І.Я.Рэйске выступаў за вывучэнне гісторыі і культуры Усходу не толькі з тэалагічнымі мэтамі, а і як часткі сусв. гісторыі і культуры. Праблемы грамадска-эканам. развіцця араб. краін сталі дасле-

даваць у новы час (франц. вучоныя Ж.Саважэ, Э.Леві-Правансаль, К.Каэн, ням. К.Бекер, англ. Д.Дэнет, Б.Льюіс, Г.А.Р.Гіб, ізраільскія А.Поляк, Д.Айялон і інш.), а сац.-эканам. і паліт. гісторыю — у найноўшы час: К.А.Наліна, Э.Росі (Італія), Г.Кампфмеер (Германія), Ч.Адамс, Дж.Хейварт-Дэн, Ш.Ісаві (ЗША), А.Хаўрані, С.Лонгрыг (Вялікабрытанія), Ж.Берк (Францыя) і інш. У 1930-я г. працы па сярэдневяковай гісторыі арабаў апублікавалі Ф.Хіці (ЗША), К.Брокельман (Германія), араб. гісторыкі Рашыд аль Бараві, Абдарахман ар-Рафі, Мухамед Сабры, Джавад Лі, Ібрахім Абдо, Р.Хуры, аш-Шафіі, Каміл Айлд і інш. Новыя тэндэнцыі ў А. адлюстраваны ў 2-м выд. «Энцыклапедыі ісламу» (т. 1—3. Лейдэн; Парыж, 1954—69).

У Расіі А. зарадзілася ў 19 ст. У яе развіцці актыўны ўдзел прымалі і беларусы. Бел. вучоны М.К.*Баброўскі* пасля падарожжа ў Зах. Еўропу (1817—22) зрабіў даклад пра араб. мовы і л-ры (надрукаваны ў час. «Вестник Европы»). Выпускнік Віленскага ун-та В.І.Сянкоўскі, здзейсніўшы ў 1819—21 навук. падарожжа ў Турцыю, Сірыю, Егіпет, прывёз цікавыя знаходкі, потым 25 гадоў загадваў кафедрай А. ў Пецярбургскім ун-це. Сав. школу А. ўзначальваў акад. І.Ю.*Крачкоўскі*. На Украіне ўсходазнаўствам і А. займаўся акад. А.Я.*Крымскі* (па бацьку з роду бел. татараў, што аселі ў Мсціславе, па маці — з дробнай шляхты з-пад Мінска). Бел. праф. У.П.Дзямідчык быў з 1954 арганізатарам А. ў Душанбінскім ун-це (Таджыкістан), дзе да 1987 узначальваў кафедру араб. філалогіі. На Беларусі пытанні вывучэння арабскіх краін распрацоўвае У.С.*Кошалеў*. Праблемы А. даследуюць у ін-тах Расійскай АН, Ін-це ўсходазнаўства ў Маскве, Ін-це Афрыкі і інш. навук. і н.-д. установах Расіі, Вялікабрытаніі, Францыі, Германіі, у т.л. ва ун-тах Лейдэна, Парыжа, Оксфарда, Кембрыджа, Прагі, Рыма, Каіра, Багдада і інш.

*Літ.*: Крачковский И.Ю. Очерки по истории русской арабистики. М.; Л., 1950; Каверин В.А. О.И.Сенковский (Барон Брамбеус): Жизнь и деятельность // Собр. соч. М., 1966. Т. 6. *А.Я.Супрун.*

**АРАБЛІ́НСКІ** (сапр. Халафаў) Гусейн Мамед аглы (сакавік 1881, Баку — 20.3.1919), азербайджанскі акцёр, рэжысёр. Адзін з заснавальнікаў азерб. прафесійнага т-ра. Сцэн. дзейнасць пачаў у 1905 у першых азерб. прафесійных трупах. Акцёр трагічнага плана, моцнага тэмпераменту, высокай культуры. Сярод роляў: Гяве («Каваль Гявэ» Ш.Салі), Франц Моор («Разбойнікі» Ф.Шылера), Атэла («Атэла» У.Шэкспіра). Ставіў п'есы класічнага і нац. рэпертуару. Першы азерб. акцёр кіно («У царстве нафты і мільёнаў», 1916).

**АРА́БСКА-АМЕРЫКА́НСКАЯ НА́ФТАВАЯ КАМПА́НІЯ** (англ. Arabian-American Oil Company; АРАМКА), заснавана ў 1933 у штаце Дэлавэр буйнейшымі нафтавымі манаполіямі ЗША для эксплуатацыі нафтавых радовішчаў Саудаўскай Аравіі (на ўмовах канцэсіі). У 1973 урад Саудаўскай Аравіі набыў 25%-ную долю ў здабычы нафты, у 1980 стаў адзіным уладальнікам АРАМКА. Здабывае каля 245 млн. т нафты за год (1983), а таксама прыродны газ. Нафта ў асноўным экспартуецца, пераважна ў краіны Зах. Еўропы, у ЗША, Японію.

**АРА́БСКАЕ ПІСЬМО́**, алфавітная сістэма пісьма. Пашыраная ў арабамоўных краінах, а таксама сярод шэрагу інш. мусульманскіх (ісламскіх) народаў (Іран, Пакістан, Афганістан і інш.). Выпрацавана ў 4—6 ст. для *арабскай мовы* на базе *арамейскага пісьма*. Да канца 1920-х г. А.п. выкарыстоўвалі носьбіты многіх цюркскіх моў (туркі, узбекі і інш.). Ім карысталіся бел. татары для напісання т. зв. *кітабаў*. З 7—8 ст. н. э., калі быў напісаны *Каран*, А.п. мала змянілася. Мае кансанантны характар. 28 літар перадаюць зычныя; 3 з іх ужываюць і для доўгіх галосных, кароткія галосныя перадаюцца дыякрытычнымі знакамі. Кожная літара А.п. мае 4 абрысы: на пачатку, у сярэдзіне, на канцы слова і пры ізаляваным ужыванні. Для прыстасавання А.п. ў асобных мовах выкарыстоўваліся дадатковыя знакі. Так, для перадачы бел. гукаў «дз' (дзь)» і «ц' (ць)» ужываліся звычайна літары «даль» і «сад» з трыма падрадковымі дыякрытычнымі кропкамі, для абазначэння гука «с» — розныя знакі: «сад» — для цвёрдага «с», а «са», «сін» або «шын» — для мяккага «с' (сь)». Накірунак А.п. гарызантальны, справа налева. Развітая каліграфія дала высокамастацкія ўзоры арнаментальнага пісьма арабскай *вяззю*. *А.Я.Супрун.*




Арабскае пісьмо.

**АРА́БСКАЯ КУЛЬТУ́РА**, сярэдневяковая культура, якая склалася ў Арабскім халіфаце ў 7—10 ст. у працэсе культ. ўзаемадзеяння *арабаў* і завяваных імі народаў. У навук. л-ры гэты тэрмін ужываецца і для абазначэння культуры ўласна араб. народаў і ў дачыненні да сярэдневяковай арабамоўнай культуры іншых народаў, што ўваходзілі ў *Халіфат*.

Фарміраванне ўласна А.к. адносіцца да перыяду ўзнікнення *ісламу* (7 ст.) і стварэння Халіфата, які ў выніку арабскіх заваяванняў ператварыўся ў велізарную дзяржаву. Заснаваная арабамі дзярж.-паліт. супольнасць, дапоўненая рэліг., а ў большасці раёнаў і моўнай супольнасцю, стварыла ўмовы для ўзнікнення агульных формаў культ. жыцця. У 8—9 ст. на араб. мову перакладзена шмат навук. і літ. помнікаў старажытнасці (сірыйскіх, сярэднеперс., індыйскіх), якія ў перакладах і апрацоўках увайшлі ў араб. пісьменства і спрыялі пераймальнай сувязі з культурай эліністычнага свету, а праз яе — з ант. і стараж.-ўсх. цывілізацыямі. Гал. цэнтрамі фарміравання А.к. ў канцы 7 — сярэдзіне 8 ст. адначасова з Дамаскам, сталіцай *Амеядаў*, былі Мекка і Медына ў Аравіі, Куфа і Басра ў Іраку. Адсюль А.к. распаўсюдзілася і далей развіта ў правінцыях Амеядскага халіфата, на велізарнай тэр. ад Пірэнеяў да р. Інд. З утварэннем *Абасідаў халіфата* (750) цэнтр А.к. з Сірыі перамясціўся ў Ірак, у заснаваны ў 762 г. Багдад. У 9—10 ст. А.к. дасягнула найвышэйшага росквіту. Яе здабыткі ўзбагацілі сусв. культуру; найб. значнымі яны былі ў філасофіі, медыцыне, матэматыцы, астраноміі, геаграфіі, філалогіі, гісторыі, хіміі, мінералогіі, у сферы матэрыяльнай культуры і мастацтва (архітэктура, маст. рамёствы). Распад халіфата Абасідаў і

ўтварэнне на яго тэр. самаст. дзяржаў прывялі да змяншэння ролі А.к. ў свеце. Але ў мусульм. Іспаніі, якая адрэзалілася ад Халіфата яшчэ ў 8 ст., пачала развівацца самастойная, т. зв. араба-ісп. культура. Ва ўсх. правінцыях Халіфата з канца 9 ст. фарміруецца асяроддзе іранскага культ. і нац. адраджэння. Перс. мова выцясняе арабскую, якая застаецца ў асн. мовай *Карана*, тэалогіі, філасофіі, некаторых прыродазнаўчых навук. Цэнтры А.к. перамясціліся ў Егіпет, Іспанію. Да канца 10 ст. Багдад саступіў першынство Каіру. У Паўн. Афрыцы пры *Фатымідах* (10—12 ст.) і *Айюбідах* (12—13 ст.) працягвалася развіццё лепшых традыцый А.к. Значэнне А.к. 8—10 ст. у гісторыі сусв. культуры абумоўлена адкрыццём яе стваральнікамі новых сродкаў навук., рэліг.-філас. і маст. пазнання свету і чалавека. Хоць навук. і эстэт. традыцыі А.к. не перарываліся, у творчасці яе дзеячаў з 2-й пал. 13 ст. запанаваў эпігонскі кірунак, назіраецца яе адставанне ад тэмпаў культ. прагрэсу ў інш. краінах мусульм. Усходу і Еўропы. Бліскучы росквіт перажыла араба-ісп. цывілізацыя ў 10—15 ст. У яе цэнтрах (Кордава, Андалусія, Севілья, Малага, Гранада) найб. поспехі дасягнуты ў астраноміі, матэматыцы, хіміі, медыцыне, філасофіі. Літ. творы гэтага перыяду — лепшыя помнікі А.к. Сусв. вядомасць набылі ісп.-маўрытанскае дойлідства і прыкладное мастацтва (гл. *Маўрытанскі стыль*). У 16 ст., калі араб. краіны ператварыліся ў правінцыі Асманскай імперыі, А.к. прыйшлі ў заняпад.

**Дакладныя і прыродазнаўчыя навукі.** Матэматычныя і астр. веды арабаў фарміраваліся пад уплывам стараж.-грэч. навукі і ў сувязі з развіццём яе ў народаў Сярэдняй Азіі, Закаўказзя, Індыі, Персіі і Егіпта. Навук. працы *Эўкліда*, *Архімеда*, *Пталамея* сталі вядомыя ў Зах. Еўропе дзякуючы арабскім перакладам. Уяўленне аб шарападобнасці Зямлі дало магчымасць арабскім вучоным правесці вымярэнні дугі зямнога мерыдыяна (827). Яны ўнеслі папраўкі і дапаўненні ў астр. табліцы, далі назвы многім зоркам (напр., Альдэбаран, Міцар, Працыён і інш.). Выкарыстоўваючы індыйскія лічбы (дзесяць матэм. знакаў), арабскія вучоныя пачалі праводзіць вылічэнні з вял. лікамі. У 10 ст. гэтыя лічбы сталі вядомыя ў Еўропе і атрымалі назву арабскіх. Арабскія матэматыкі ўвялі паняцце «алгебра» (М.Харэзмі), *трыганаметрычныя функцыі*, устанавілі залежнасці паміж імі, зрабілі шэраг адкрыццяў у геаметрыі і астраноміі. У Багдадзе, Самаркандзе і Дамаску існавалі астр. абсерваторыі. Значны ўклад арабаў і ў развіццё медыцыны. Ібн аль-Байтар апісаў больш за 2600 лекавых прэпаратаў, лекавых і інш. раслін. «Канон медыцыны» *Ібн Сіны* (Авіцэна) стаў настольнай кнігай зах.-еўрапейскіх медыкаў. Шэраг адкрыццяў у фармакалагічнай хіміі зрабіў алхімік Джабір Ібн Хайян (8 ст.).

**Геаграфія.** Араб. геагр. л-ра не мела сабе роўных па змястоўнасці і разнастайнасці жанраў. У ёй захавалася апісанне ўсяго мусульм. Усходу, краін Еўропы, Паўн. і Цэнтр. Афрыкі, узбярэжжа Усх. Афрыкі і Азіі (да Карэйскага п-ва), Малайскага архіпелага. Працы араб. географаў і падарожнікаў — найважнейшыя, часам унікальныя сведчанні аб народах сярэдніх вякоў. Геаграфічны светапогляд даісламскіх арабаў адлюстраваны ў стараж. паэзіі і Каране. Арабская навук. геаграфія ўзнікла

Да арт. **Арабская культура.** Старажытныя вароты Багдада.

на мяжы 8—9 ст., калі з'явіліся пераклады і апрацоўкі астранома-геагр. прац ант. аўтараў, асабліва Пталамея. Вучоныя (Батані, Харэзмі і асабліва Біруні) выкарыстоўвалі разліковыя правілы і табліцы сферычнай астраноміі. Іх карты паўтаралі карты Пталамея або нагадвалі стараж.-іранскія. У 9 ст. імі створана апісальная геаграфія (Ібн Хардадбех, Кудама ібн Джафара, аль-Якубі), якая развівалася і ў 10—14 ст. (запіскі Ібн Фадлана і Абу Дулафа, дырыушы Абу Хаміда аль-Гарнаці, Ібн Джубайра і Ібн Батуты, апісанні падарожжа ў Расію Макарыя Антыяхійскага і інш.). Росквіт араб. геагр. л-ры прыпадае на 10 ст., калі ў працах вучоных класічнай школы (аль-Істахры, Ібн Хаукаля, аль-Мукадасі), прысвечаных апісанню гандл. шляхоў і мусульм. свету, змяшчаўся багаты геагр. і гіст.-культ. матэрыял. У 11—14 ст. узніклі жанры геагр. слоўнікаў (аль-Казвіні, Якута, аль-Бакры) і касмаграфіі (працы аль-Казвіні, аль-Дзімашкі, Абу-ль-Фіды). У Еўропе найб. вядомыя былі працы аль-Ідрысы (1100—65 ці 61), творы якога з 70 картамі (пазначана і р. Прыпяць) — лепшы геагр. трактат сярэднявечча. У далейшым развіццё геаграфіі ішло па шляху стварэння шматлікіх кампіляцый (творы аль-Макрызі). Геаграфічныя раздзелы ў творах ан-Нувайры, аль-Умары, аль-Калькашандзі, Ібн Маджыда (лоцман Васка-да-Гамы, 15 ст.) і аль-Мехры (16 ст.) абагульнілі тэорыю і практыку мараплавання.

**Філасофія.** Працяглы час араб. філасофія была звязана з тлумачэннем ісламу. На рубяжы 7—8 ст. у яе асяроддзі вяліся дыскусіі пра сутнасць і атрыбуты Бога, абсалютную прадвызначанасць свету, свабоду чалавека ў ім, паходжанне Карана і інш., што прывяло да ўзнікнення мусульм. рацыяналіст. тэалогіі — калама. У яе межах вылучылася школа мутазілітаў (засн. Васіль Ібн Ата, тэарэтыкі аль-Алаф, ан-Назан, аль-Джахіз), прадстаўнікі якой арыентаваліся на традыцыі Арыстоцеля і неаплатонікаў, сцвярджалі прыярытэт веры над розумам, спрадвечнасць Карана, праводзілі ідэі монатэізму. Рэакцыяй на мутазілізм стала ханбаліцкая школа (засн. Ахмад Ібн Ханбала) прыхільнікаў суніцкага традыцыяналізму, якія заклікалі арыентавацца на лад жыцця прарока *Мухамеда* і яго «праведных продкаў», выступалі супраць нававвядзенняў у веравучэнні і праве. На пач. 10 ст. прадстаўнікі новага кірунку каламу — ашарызму (засн. Абу-Хасан, аль-*Ашары*) зрабілі спробу кампрамісу з вучэннем традыцыяналістаў-дагматыкаў. Жаданне навукова абгрунтаваць ісламскую тэалогію абумовіла зацікаўленасць да ант. філас. спадчыны. Асновай араб. філасофіі стаў «неаплатанізаваны» арыстоцелізм — усх. перыпатэтызм (гл. *Перыпатэтычная школа*). Ідэі ўсх. перыпатэтызму развіты ў творах *Фарабі* і Ібн Сіны. Тайнае рэліг.-філас. т-ва «Братоў чысціні і шчырасці» (2-я пал. 10 ст.) імкнулася спалучыць ісламскі з эліністычнай філасофіяй. Другой формай апазіцыі артадоксам і прыхільнікам рацыяналізму стаў містыка-аскетычны кірунак у ісламе — *суфізм*. Злучыць ісламскі традыцыяналізм з суфійскімі ідэаламі імкнуліся абу-Хамід аль-Газалі (1058—1111) і Ібн аль-Арабі (1163—1240). У гэты ж перыяд распрацоўвалася і рэліг.-філас. сістэма *шыізму*. У 12 ст. цэнтр араб. філасофіі перамясціўся ў мусульм. Іспанію і Паўн. Афрыку. Заснавальнік зах.-араб. філасофіі — сарагоскі філосаф Ібн Бадж (каля 1070—1138). Яго рацыяналістычную лінію прадаўжаў Ібн Туфайль (1110—85). Вяршыні зах.-араб. філасофія дасягнула ў вучэнні *Ібн Рушда*, які лічыў, што бессмяротны толькі агульны чалавечы розум у яго гіст. развіцці. Заснавальнікам філасофіі гісторыі і арыгінальнай сацыялагічнай тэорыі быў *Ібн Хальдун*. Араб. філасофія паўплывала на еўрап. філасофію і сусв. духоўную культуру.

**Гістарычная навука.** Арабская гістарыяграфія як самаст. дысцыпліна вылучылася на мяжы 8—9 ст. Першыя запісы гіст. зместу адносяцца да канца 7 ст. Матэрыялам для ранніх помнікаў гіст. л-ры на араб. мове служылі гіст.-генеалагічныя паданні араб. плямёнаў, напаўлегендарныя паведамленні пра даісламскія дзяржавы ў Паўд. Аравіі і пра арабскія княствы ў Сірыі і Іраку, а таксама рэліг.-гіст. паданні пра ўзнікненне і пашырэнне ісламу. Значную

ролю адыгралі астр. веды (устанаўленне храналогіі сусв. гісторыі), іранскія гіст.-эпічныя і іудзейска-хрысц. паданні. Ідэю дыдактычнай каштоўнасці гісторыі, прынятую большасцю мусульм. гісторыкаў, найб. дакладна сфармуляваў Ібн Міскавайх. Спробу выкладаць гіст. падзеі ў іх прычыннай сувязі зрабіў Ібн Хальдун, распрацаваўшы арыгінальнае вучэнне пра агульныя законы развіцця грамадства. Найбуйнейшы прадстаўнік ранняга перыяду араб. гістарыяграфіі — Мухамед-аз-Зухры (п. у 741 ці 742). Першы вялікі гіст. твор на араб. мове (гісторыя стараж. прарокаў і жыццяпіс Мухамеда) стварыў Ібн Ісхак (каля 704—768 ці 767). Значныя працы пакінулі аль-Вакідзі (747—823), Ібн Сад (п. 845) і інш. Гісторыкі 8—9 ст. прысвячалі свае творы араб. заваёвам, грамадз. войнам у Халіфаце 7 — пач. 8 ст. аль-Масудзі (п. у 956 ці 957), Хамзы аль-Ісфахані (п. у 2-й пал. 10 ст.) і інш. Гісторыкі 9—10 ст. вылучаліся энцыклапедычнасцю ведаў (Якубі і Масудзі). З 2-й пал. 10 ст. ў гістарыяграфіі пераважалі дынастыйныя і мясц. хронікі. У гіст. энцыклапедыі йеменскага гісторыка аль-Хамдані (п. у 2-й пал. 10 ст.) сабраны звесткі па генеалогіі, гісторыі, археалогіі, геаграфіі і л-ры Паўд. Аравіі. У 12—13 ст. дынастыйная гісторыя найб. развіта ў Сірыі, дзе створана ўсеаг. гісторыя Абу-ль-Фіда (1273—1331). У 15—16 ст. вядучае месца занялі егіп. гісторыкі (працы па гісторыі *мамлюкаў*, гіст. энцыклапедыі і ўсеагульныя хронікі), асабліва плеяда гісторыкаў-палігістараў (аль-Макрыдзі, 1364—1442), якія пакінулі шматтомныя працы па паліт., сац.-эканам. і культ. гісторыі Егіпта. Значнае месца займала біягр. л-ра: біягр. слоўнікі Якута, Ібн Халікана, зборы біяграфій дзеячаў навукі і мастацтва.

Да арт. **Арабская культура.** Мінарэт аль-Мальвія мячэці Мутавакіля ў Самары (Ірак). 9 ст. (злева); мазаіка мячэці Кубат ас-Сахра ў Іерусаліме. 7 ст.

Цэнтрам араб. гістарыяграфіі доўгі час быў Ірак. Найб. значныя працы па ўсеагульнай гісторыі пакінулі аль-Белазуры (каля 820 — каля 892), Абу Ханіфы ад-Дынаверы (п. каля 895), аль-Якубі ат-Табары (832 ці 839—923, аўтар шматтомнай «Гісторыі прарокаў і цароў»), інш. Гіст. творы на араб. мове напісаны і ў інш. краінах мусульм. Усходу.

**Літаратура.** Вытокі араб. л-ры ў вуснай нар. паэзіі вандроўных араб. плямёнаў. У дакласавым грамадстве склаліся паэтычныя жанры: ганьбаванне ворага (хіджа), пахвальба (фахр), песня помсты (сар), жалобнае галашэнне ці элегія (рыса), элементы любоўнай і апісальнай лірыкі (насіб і васф). Росквіт даісламскай (бедуінскай) паэзіі — 5—7 ст. У запісах 8—10 ст. (анталогія «Кніга песень» *Абу-ль-Фараджа аль-Ісфахані* і інш.) дайшлі вершы каля 125 паэтаў, сярод якіх абаронцы інтарэсаў сваіх плямёнаў (Амр ібн Кульсум, аль-Харыс ібн Хіліза), выразнікі ідэалаў патрыярхальнай даўніны (Тарафа, Лабід ібн Рабія), песняры воінскай доблесці (Антара ібн Шадад) або ўцех (Імру-ль-Кайс — стваральнік класічнай касыды), багашукальнікі (Умейя ібн Абі-с-Сальт), прыдворныя панегірысты (Набіга, Зухайр, Аша). Першы помнік араб. пісьменства і прозы — Каран. Увядзенне ісламу прыпыніла развіццё паэзіі, але з канца 7 ст. яна адраджаецца ў Сірыі і Іраку. У арыстакратычным асяроддзі вял. гарадоў Халіфата ўзнікла любоўная лірыка (Амар ібн Абі Рабія). Сярод бедуінаў Аравіі вылучаліся песняры ідэальнай любові. Пазней складаюцца рамант. аповесці пра пары закаханых (Джаміл і Бусайна, Меджнун і Лейла і інш.). Пры Абасідах араб. л-ра зазнала моцны ўплыў культуры народаў Пярэдняй Азіі, асабліва персаў. Пачынальнік «новага стылю» — паэт Башар ібн Бурд, тэарэтык — Ібн аль-Мутаз. Вылучаюцца геданістычная і вальнадумная лірыка *Абу Нуваса* і аскетычныя вершы Абу-ль-Атахія. У 9 ст. ў творчасці іх пераемнікаў, багдадскіх паэтаў, на першы план выступіла паліт. сатыра; у 10 ст. — грамадз. і філас. лірыка панегірыста аль-*Мутанабі* і сірыйскага паэта аль-*Маары*. Касыдную традыцыю падтрымлівалі паэты 9 ст. Абу Тамам і аль-Бухтуры. У прозе 8—9 ст. вядучае месца займалі аль-*Джахіз* і Ібн Кутайба. Празаікі 10 ст. — ат-Таўхідзі і ат-Танухі, стваральнік жанру авантурнай навелы (макамы) — Бадзі аз-Заман аль-Хамадані. З 8 ст. развіваецца араб. л-ра Магрыба, якая дасягнула найвышэйшага росквіту ў 11—12 ст. у гарадах араба-мусульм. Іспаніі. У 11 ст. ў творчасці севільскіх паэтаў (Ібн Зайдун, аль-Мутамід ібн Абад, Ібн Хамдзіс і інш.) сцвердзіўся ідэал асвечанага рыцара; у андалузскай паэзіі пашырыліся новыя, страфічныя формы араб. верша — мувашах, заджал (Ібн Кузман). Пасля мангольскага нашэсця (13 ст.) цэнтр араб. л-ры перамяшчаецца ў Егіпет і Сірыю. У 13—15 ст. і пазней з'яўляюцца нар. творы ў жанры сіра — цыклы вусных апавяданняў на гераічныя і любоўныя тэмы, своеасаблівыя рыцарскія раманы. Кн. казак «Тысяча і адна ноч» канчаткова склалася ў Егіпце (14—15 ст.).

**Мастацтва.** Арабская архітэктура ўвабрала ў сябе традыцыі Рыма, Візантыі, сасанідскага Ірана. Араб. архітэктары стварылі новыя тыпы і комплексы будынкаў: *мячэці* з *мінарэтамі*, маўзалеі-«дзюрбэ», *медрэсэ*, караван-сараі, палацы правіцеляў і інш., пашырылі купальныя канструкцыі і

арнаментыку. Сярод выдатных арх. помнікаў мячэці Амеядаў у Дамаску (гл. *Амеядаў мячэць*) і Кубат ас-Сахра ў Іерусаліме (687—691), палацавыя комплексы ў Мшаце, Кусейр-Амра (абодва 8 ст., Іарданія). У перыяд праўлення Абасідаў у Самары пабудавана мячэць Мутавакіля (9 ст.) з конусным спіральным мінарэтам аль-Мальвія. Сярод выдатных помнікаў араб. дойлідства ў Каіры мячэці Ібн Тулуна (876—879), аль-Азхар (969—972), ансамблі султанаў Калауна (1284—85) і Хасана (1356—63). Своеасаблівая, т. зв маўрытанская, архітэктура склалася ў Іспаніі (Вял. мячэць у Кордаве, 8—9 ст.; палацавы комплекс *Альгамбра* ў Гранадзе, 13—14 ст.).

Выяўленчае мастацтва развівалася пераважна ў насценных размалёўках, арх. пластыцы, разьбе, мініяцюры (Егіпет 10—11 ст., багдадская школа мініяцюры 13—14 ст.). Дэкар.-прыкладное мастацтва вызначалася дэкаратыўнасцю. Складанымі арнаментальнымі кампазіцыямі ўпрыгожвалі кнігі («Макамем» аль-Харыры, 11 ст.). Арабы стварылі і распаўсюдзілі *арабескі* і эпіграфічны арнамент — каліграфічна выкананыя надпісы. Шырока вядомыя вырабы маст. рамёстваў: кераміка і шкло Сірыі, Ірака, Егіпта, дамаская зброя, маўрытанская кераміка, маст. бронза (ліццё і чаканка), разьба па дрэве і камені, дэкар. шаўковыя і парчовыя тканіны.

Умузыцы развіваліся старадаўнія песенныя жанры хіда (караванныя песні), хіджа (сатыр. песня) і інш. Існавалі араб. прафес. спевакі-паэты (шаіры). Сярод традыц. інструментаў мізхар, кісара, барбат (тыпы лютні), джанк (арфа), касаба (тып флейты), кус (літаўра). З 7 ст. развівалася класічная араб. музыка (пераважна вакальная), муз. навука (трактаты аль-Кіндзі, аль-Фарабі, Ібн Сіны, Сафі ад-Дзіна, аль-Ісфахані).

*Літ.*: История философии. Т. 1. М., 1957. С. 222—236; История философии в кратком изложении: Пер. с чеш. М., 1991. С. 342—349; Основы религиоведения. М., 1994. С. 222—232; Веймарн Б., Каптерева Т., Подольский А. Искусство арабских народов. М., 1960; Еолян И. Очерки арабской музыки. М., 1977.

*С.Ф.Дубянецкі* (філасофія).

**АРА́БСКАЯ ЛІ́ГА**, гл. *Ліга арабскіх дзяржаў*.

**АРА́БСКАЯ МО́ВА**, адна з *семіцкіх моў*. Афіц. мова ўсіх араб. краін. Адна з афіц. і рабочых моў ААН. Мае 5 груп дыялектаў (іракская, сірыйская, аравійская, егіпецкая, магрыбская). Фанетыка багатая сістэмай зычных (28 фанем). Носьбітамі лексічнага значэння ў слове з'яўляюцца 3 зычныя, з якіх складаецца корань. З галосныя ў розных камбінацыях афармляюць граматычную характарыстыку слова: час, лад, трыванне і інш. Назоўнік і прыметнік адрозніваюцца ў залежнасці ад іх пазіцыі ў сказе. Дзеяслоў багаты формамі. У ролі службовых слоў — назоўнікі. Літ. А.м. пачала складвацца ў 4—6 ст. у даісламскай паэзіі і ў 7 ст. ў мове *Карана*. Росквіту дасягнула ў эпоху арабскага халіфата (9—11 ст.). З 6 ст. А.м. карыстаецца арабскім пісьмом.

*Літ.*: Юшманов Н.В. Грамматика литературного арабского языка. 3 изд. М., 1985.

*В.У.Мартынаў*.

**АРА́БСКАЯ ПАРО́ДА** верхавых коней. Выведзена арабамі ў 4—8 ст. на Аравійскім п-ве шматвяковым адборам. Выкарыстоўвалася ў розных краінах свету пры стварэнні і ўдасканаленні арлоўскай рысістай, чыстакроўнай верхавой, тракененскай і інш. парод. А.п. гадуюць у Індыі, Пакістане, Егіпце, Турцыі, ЗША, Канадзе, краінах Еўропы. На Беларусі перспектыўная ў спорце, турызме.

Коні невялікія (выш. ў карку жарабцоў 151, кабыл 148 см), вельмі прыгожыя і грацыёзныя. Маюць высокую пладавітасць, непераборлівыя, трывалыя. Масць шэрая, гнядая, рыжая. Рэзвасць на 1000 м — 1 мін

Жарабец арабскай пароды.

8 с; 1600 м — 1 мін 48,8 с; 2700 м — 2 мін 41 с.

**АРА́БСКАЯ РЭСПУ́БЛІКА ЕГІ́ПЕТ**, гл. *Егіпет*.

**АРА́БСКІ ВАЛЮ́ТНЫ ФОНД** (Arab Monetary Fund; АВФ). Засн. ў 1976. Члены — 21 краіна араб. рэгіёна. Штаб-кватэра ў г. Абу-Дабі (Аб'яднаныя Арабскія Эміраты). Мэты: выраўноўванне плацежных балансаў краінудзельніц; садзейнічанне стабілізацыі курсаў валют; развіццё эканам. інтэграцыі; стварэнне арабскага фін. рынку і ўкараненне арабскага дынара ва ўзаемаразліках араб. краін. Павінен таксама крэдытаваць краіны-ўдзельніцы.

**АРА́БСКІ ФОНД ЭКАНАМІ́ЧНАГА І САЦЫЯ́ЛЬНАГА РАЗВІЦЦЯ́** (Arab Fund for Economicand Social Development; АФЭСР), міжнародная фінансава-крэдытная арг-цыя. Засн. ў 1968. Члены — 21 краіна Блізкага Усходу і Паўн. Афрыкі. Штаб-кватэра ў Кувейце. Мэта: садзейнічаць эканам. і сац. прагрэсу арабскіх краін, даючы ім крэдыты.

**АРА́БСКІ ХАЛІФА́Т**, гл. ў арт. *Халіфат*.

**АРА́БСКІЯ ЗАВАЯВА́ННІ**, ваенныя паходы арабаў у 30-я г. 7 — пач. 9 ст., у ходзе якіх створана феад.-тэакратычная дзяржава — Арабскі халіфат. На працягу 7 ст. заваяваны Сірыя, Палесціна, Месапатамія, Егіпет, амаль уся Паўн. Афрыка, Іран; на пач. 8 ст. — Закаўказзе і міжрэчча Амудар'і і Сырдар'і ў Сярэдняй Азіі; у 712 — Сінд (тэр. ў ніжнім цячэнні Інда), у 711—714 — б. ч. Пірэнейскага п-ва, пазней — Сіцылія, Мальта, Крыт. На заваяваных тэрыторыях распаўсюджваўся іслам, адбывалася арабізацыя мясц. насельніцтва (акрамя Ірана і Сярэдняй Азіі). У выніку ўзаемадзеяння арабаў з заваяванымі народамі ўзнікла сярэдневяковая *арабская культура*. З 1-й чвэрці 9 ст. пачаўся паліт. распад халіфата на адасобленыя часткі. Барацьбу за вызваленне ад араб. экспансіі карэннае насельніцтва Пірэнейскага п-ва вяло некалькі стагоддзяў (гл. *Рэканкіста*).

*У.С.Кошалеў*.

**АРА́БСКІЯ ЛІ́ЧБЫ**, назва дзесяці матэм. знакаў: 0, 1, 2, 3, 4, 5, 6, 7, 8, 9, з дапамогай якіх па дзесятковай сістэме лічэння запісваюцца любыя лікі. Узніклі ў Індыі (не пазней як у 5 ст.), у Еўропе вядомыя з 10—13 ст. з араб. крыніц (адкуль і назва).

**АРА́БЫ** (саманазва аль-араб), група народаў, асн. насельніцтва араб. краін Зах. Азіі і Паўн. Афрыкі. Жывуць таксама ў Іране, Турцыі, Ізраілі, Самалі, Эфіопіі і інш., значныя групы А.-эмігрантаў жывуць у Паўд. і Паўн. Амерыцы, Францыі і інш. Агульная колькасць больш за 175 млн. чал. (1987). Гавораць на *арабскай мове*. Большасць вернікаў — мусульмане-суніты, частка — шыіты, абадзіты, друзы, ёсць і хрысціяне. Гл. таксама *Алжырскія арабы*, *Егіпецкія арабы*, *Іракскія арабы*, *Йеменскія арабы*, *Ліванскія арабы*, *Лівійскія арабы*, *Мараканскія арабы*, *Суданскія арабы*.

Мяркуецца, што семіцкія плямёны, якія далі пачатак араб. народам, аўтахтонныя жыхары Аравійскага п-ва. У 1-м тыс. да н.э. ўзніклі першыя араб. дзяржавы Пальміра, Набатэя і Ліх'ян (на Пн Аравіі), у 5—6 ст. н. э. — Гасан і Лахм (на Пд Аравіі), Кінда (Цэнтр. Аравія). У гэты час пачаўся працэс фарміравання араб. народа. Тагачасныя А. знаходзіліся на стадыі разлажэння племяннога ладу, хоць патрыярхальна-радавыя адносіны і племянныя сувязі захоўваліся яшчэ вельмі доўга. З 1-й пал. 7 ст. ўзмацнілася пранікненне А. у суседнія краіны. У выніку *арабскіх завяванняў* утварыўся велізарны Арабскі халіфат (гл. *Халіфат*), які ахопліваў тэр. ад Індыі да Атлантычнага ак. і ад Сярэдняй Азіі да Цэнтр. Афрыкі. Заваяванае насельніцтва, асабліва ў Паўн. Афрыцы, прыняло мову, рэлігію (іслам), элементы матэр. і духоўнай культуры А. і было хутка арабізавана. Разам з тым і А. многае ўзялі з культуры заваяваных народаў. У выніку склалася своеасаблівая *арабская культура*, якая зрабіла вял. ўплыў на сусв. культуру. Створаны сілай

зброі Арабскі халіфат у 9—10 ст. распаўся на Багдадскі (гл. *Абасідаў халіфат*), Каірскі (гл. *Фатымідаў халіфат*), *Кардоўскі халіфат*, а пазней на больш дробныя халіфаты, эміраты, княствы. У 16 ст. араб. краіны Пярэдняй Азіі (акрамя значнай ч. Аравійскага п-ва) і Паўн. Афрыкі (за выключэннем Марока) увайшлі ў *Асманскую імперыю*. З 19 ст. араб. землі — арэна барацьбы паміж калан. дзяржавамі, а ч. тэр. Марока захоплена Партугаліяй яшчэ ў 15—16 ст. Вызваленчая барацьба А., якая не спынялася і ў 19 — 20 ст., прынесла араб. краінам дзярж. незалежнасць.

**АРАВА́** (раней Арэва), вёска на Беларусі, у Круглянскім пасялковым Савеце Круглянскага р-на Магілёўскай вобл. За 11 км на Пн ад Круглага. 73 ж., 41 двор (1995).

Узнікла не пазней як у 1-й трэці 16 ст. на землях Друцкага княства як маёнтак князёў Друцкіх-Горскіх. Упершыню згадваецца ў дакументах Метрыкі ВКЛ у 1541 і 1544. У Лівонскую вайну 1558—83 спалена рус. войскамі (1566). Пасля 1772 у Шклоўскім пав. Магілёўскай губ. У 1835 заснавана вінакурня, у канцы 19 ст. — кардонная мануфактура, млын, у пач. 20 ст. паселішча ў Круглянскай вол. Магілёўскага пав., складалася з маёнткаў Вялікая А. і Малая А. У складзе калгаса «Свабода». Пач. школа, клуб, магазін. Каля вёскі курганны могільнік.

**АРАВА́КІ**, група індзейскіх плямёнаў (гуахіра, кампа, мачычэнга, баніва, уласна А. і інш.) у Паўд. Амерыцы. 400 тыс. чал. (1987). Гавораць на аравакскіх мовах.

**АРАВІ́ЙСКА-АФРЫКА́НСКАЯ ФАРЫТАНО́СНАЯ ПРАВІ́НЦЫЯ**, на Аравійскім п-ве, на Пн Афрыкі, адна з найбуйнейшых у свеце. Пл. больш за 9 млн. км². Вылучаюцца 8 бас. з запасамі фасфарытаў 75 млрд. т, найбольшыя запасы ў Марока, Зах. Сахары, Егіпце, Тунісе. Прамысл. распрацоўка з пач. 20 ст. Здабыча адкрытым і падземным спосабамі, абагачэнне. Экспарт пераважна ў краіны Зах. Еўропы. Буйнейшыя краіны-экспарцёры Марока, Іарданія, Туніс, Ізраіль, Сенегал, Сірыя, Алжыр.

**АРАВІ́ЙСКАЕ МО́РА**, паўзамкнёнае мора Індыйскага ак. паміж паўастравамі Індастан на У і Аравійскім на З. Абмывае берагі Самалі, Джыбуці, Емена, Амана, ААЭ, Саудаўскай Аравіі, Кувейта, Ірака, Ірана, Пакістана, Індыі. Пл. 4832 тыс. км². Сярэдняя глыб. 2734 м, найб. 5803 м. Берагі высокія, скалістыя, месцамі нізінныя дэльтавыя, парэзаныя залівамі і бухтамі. Найб. заліў: Адэнскі на З (злучаецца Ба-б-эль-Мандэбскім пралівам з Чырвоным м.), Аманскі на ПнЗ (злучаецца Армузскім пралівам з Персідскім залівам), Кач і Камбейскі на ПнУ. Найб. а-вы: Сакотра і Лакадыўскія. У А.м. ўпадае р. Інд. Рэльеф дна выраўнаваны, агульны нахіл з Пн на Пд; на З падводны хр. Мары. Клімат трапічны мусонны. Частыя тайфуны. Сярэдняя т-ра вады на паверхні зімой 22—27 °С, летам 23—28 °С. Салёнасць 35,8—36,5‰. Прылівы паўсутачныя (да 5,1 м). Фауна: дзюгонь, лятучыя рыбы, тунец, меч-рыба, паўд. селядзец, рыфавыя рыбы, парусянкі і інш. Гал. парты: Бамбей (Індыя), Карачы (Пакістан), Адэн (Емен). *З.А.Андрыеўская.*




**АРАВІ́ЙСКІ АРТЭЗІЯ́НСКІ БАСЕ́ЙН**, размешчаны на аднайм. паўвостраве, займае б. ч. тэр. Саудаўскай Аравіі. Пл. каля 1500 тыс. км². Прымеркаваны да Аравійскай пліты з дакембрыйскім фундаментам. Асн. ваданосныя комплексы звязаны з палеазойскімі, мезазойскімі, палеагенавымі і неагенавымі адкладамі. Дэбіты свідравін 0,1—79 л/с і больш (у аазісе Эль-Хаса 227 л/с), крыніц 0,5—528 л/с (некаторыя фантануюць). Мінералізацыя вады 1—5,5 г/л. Рэсурсы падземных водаў папаўняюцца пераважна ад інфільтрацыі атм. ападкаў і кандэнсацыі вільгаці. Воды басейна выкарыстоўваюць на забеспячэнне нас. пунктаў, прамысловасці, на арашэнне.

**АРАВІ́ЙСКІ ПАЎВО́СТРАЎ**, Аравія (ад стараж.-яўр. араба пустыня), на ПдЗ Азіі, самы вялікі ў зямным шары. Пл. каля 2730 тыс. км². Працягласць з ПнЗ на ПдУ 2700 км. Абмываецца на З Чырвоным м., на Пд Адэнскім заліве і Аравійскім м., на У Аманскім і Персідскім залівамі. Мяжу на Пн звычайна праводзяць па 30° паўн. шыраты. Паверхня А.п. — плато з узвышанымі зах. і паўд. ўскраінамі (пераважныя выш. 1000—2000 м), размешчанае на Аравійскім шчыце. Найб. высокія горныя вобласці на ПдЗ — горы Хіджаз і Йе-

менскія (выш. 3600 м, г. Эн-Набі-Шаіб) і на ПдУ Асманскія горы (выш. 3353 м, г. Шаме). Уздоўж зах. берага нізіна Тыхама, уздоўж усх. — Эль-Хаса. На Пн пясчаныя пустыні Вял. Нефуд, М. Нефуд, на Пд пустыня Руб-Эль-Халі. Фундамент А.п. складзены са стараж. крышт. парод (архейскія сланцы і граніты) і ўкрыты на Пн і У мезазойскімі, палеагенавымі і неагенавымі вапнякамі і пясчанікамі. Карысныя выкапні: буйныя радовішчы нафты (гл. *Персідскага заліва нафтагазаносны басейн*), золата, жал. і поліметалічныя руды, кухонная соль, буд. матэрыялы. Клімат на Пн субтрапічны, на Пд трапічны, сухі. Сярэднія т-ры студз. ад 7 °С на Пн да 24 °С на Пд, ліп. адпаведна 25 і 30 °С (самы цёплы — чэрв., максімум да 55 °С). Ападкаў на раўнінах каля 100 мм, у гарах Йемена 500 мм за год (індыйскі мусон). Малы сцёк, рэдкая сетка рэк і азёраў, сухія рэчышчы — вадзі. Вял. роля належыць падземным водам і карставым крыніцам. Пастаянныя вадасцёкі на Пд і ПдЗ — рэкі Масіла, Тыбан і інш. Большая ч. тэрыторыі — зона пустыняў і паўпустыняў. На прымітыўных шэразёмах жорсткая падушкападобная паўхмызняковая расліннасць (вярблюджая калючка, палын, салянкі, ахіла), шматгадовыя травы (арыстыда, астрагал), пашыраны перакаці-поле, іерыхонская ружа, лішайнік манна; па схілах гор лістападобныя лясы з дробным лісцем (акацыі, мімозы, друр-джуп, трапляюцца кактусападобныя малачаі); на ПдУ — саванны. У рэдкіх аазісах — фінікавая пальма, садавіна, бавоўнік. Жывёльны свет: антылопы, газелі, дзікі кот, шакалы, гіены, ліс фянёк, бабуіны, гамадрылы, сабакападобныя малпы; з птушак — арлы, ястрабы, сокалы, на ўзбярэжжах — фламінга, пеліканы, чаплі; паўзуны — рагатая гадзюка, гюрза, кобра, хамелеоны. На тэр. А.п. дзяржавы Саудаўская Аравія, Йемен, Аман, Аб'яднаныя Арабскія Эміраты, Кувейт, частка Ірака і Іарданіі. *М.В.Лаўрыновіч.*

**АРАВІЙСКІ ШЧЫТ**, гл. *Нубійска-Аравійскі шчыт.*

**АРАГАНІТ** [ад назвы гіст. вобл. Арагон у Іспаніі), мінерал класа карбанатаў, $Ca[CO_3]$. Крышталізуецца ў рамбічнай сінганіі. Крышталі ігольчастыя, агрэгаты валакністыя, слупкаватыя, каралападобныя («жалезныя кветкі») і інш. Бясколерны, белы, шэры, сіні, фіялетавы да чорнага. Празрысты да паўпразрыстага. Бляск шкляны. Цв. 3,5—4. Шчыльн. каля 3,0 г/см$^3$. Разнавіднасць: канхіт — частка перламутравага слоя ракавін малюскаў і жэмчугу. Паходжанне гідратэрмальнае і гіпергеннае. Адкладваецца гарачымі крыніцамі і гейзерамі, у мінадалінах базальтаў і інш. Афарбаваныя, прасвечвальныя разнавіднасці А. (мармуровы онікс) — выразныя камяні.

**АРАГА́Ц** (арм.), Алагёз (цюрк.), найвышэйшая вяршыня Армянскага нагор'я, у Арменіі. Выш. 4090 м. Патухлы вулкан, кратэр якога стаў ледавіковым цыркам. Складзены з лавaў і туфаў. Ёсць невял. ледавікі. На схілах стэпы з нагорнымі ксерафітамі. Горныя пашы. Па паўд. схіле Бюраканская астрафіз. абсерваторыя; рэшткі сярэдневяковай крэпасці Анберд.

**АРАГЕ́Н** (ад грэч. oros гара + genos паходжанне), геалагічны тэрмін, уведзены аўстр. геолагам Л.Коберам (1921) для азначэння заключнай стадыі развіцця тэктанічна рухомых зон зямной кары — *геасінкліналяў*; складкавае горнае ўтварэнне, што ўзнікае на месцы геасінклінальнай сістэмы на позніх стадыях яе эвалюцыі.

**АРАГЕНЕ́З** у біялогіі, тое, што *Арамарфоз.*

**АРАГЕНЕ́З** (ад грэч. oros гара + ...*генез*) у геалогіі, тое, што *Гораўтварэнне.*

**АРАГО́** (Arago) Дамінік Франсуа (26.2.1786—2.10.1853), французскі астраном, фізік і паліт. дзеяч. Чл. Парыжскай АН (1809). Скончыў Політэхн. школу ў Парыжы, дзе ў 1809—31 праф., з 1830 неадменны сакратар Парыжскай АН і дырэктар Парыжскай астр. абсерваторыі. Пасля Лют. рэвалюцыі 1848 у складзе Часовага ўрада. Навук. працы па астраноміі, оптыцы, эл.-магнетызму, метэаралогіі, фіз. геаграфіі. Ініцыятар даследаванняў, якія прывялі да адкрыцця Нептуна, атрымання першых фатаграфій Сонца.

Аравійскі паўвостраў. Падушкавыя формы раслін у камяністай пустыні.

Араганіт.

**АРАГО́Н** (Aragón), аўтаномная вобласць на ПнУ Іспаніі, на мяжы з Францыяй. Пл. 47,7 тыс. км$^2$, нас. 1,2 млн. чал. (1991). Адм. ц. — г. Сарагоса. Буйныя гарады Уэска і Тэруэль. Уключае правінцыі Сарагоса, Тэруэль і Уэска. Займае Арагонскую раўніну ў бас. р. Эбра. Акаймавана Пірэнейскімі (пік Анета, 3404 м), Іберыйскімі, Кантабрыйскімі і Каталонскімі гарамі. Клімат міжземнаморскі, засушлівы. Сярэднія т-ры студз. 4—8 °С, ліп. 20—24 °С. Ападкаў 350 мм за год. Эканоміка агр.-прамысловая. Земляробства пераважна арашальнае ў даліне р. Эбра. Вырошчваюць пшаніцу, ячмень, кукурузу, цукр. буракі, шафран, садавіну, агародніну, вінаград, міндаль, масліны, на паліўных землях — рыс, тытунь, траву альфа. Гадуюць авечак, козаў. Здабыча бурага вугалю, жал. руды. На горных раках некалькі ГЭС, працуюць ЦЭС на бурым вугалі. Прамысловасць: чорная і каляровая металургія, маш.-буд. (трансп. і с.-г. машыны), металаапр., электратэхн., хім., цэментная, шкляная, папяровая, тэкст., харч., гарбарна-абутковая. Чыг. і аўтамаб. транспарт, нафта- і газаправоды, у Сарагосе міжнар. аэрапорт.

У 9 ст. ў ходзе *Рэканкісты* засн. графства А. На пач. 11 ст. тэр. А. далучана да каралеўства Навара, у 1035 самастойнае каралеўства, якое на аснове асабістай уніі аб'ядналася ў 1137 з Барселонскім графствам. У 1164 графы Барселоны сталі каралямі і ўключылі ў А. усе землі Каталоніі. У 13—15 ст. А. адваяваў у маўраў Балеарскія а-вы, Валенсію, Сіцылію, Сардзінію, Неапалітанскае каралеўства. У 1479 каралеўства А. з Кастыліяй аб'ядналіся ў адзіную дзяржаву — Іспанію. У 1978 А. атрымаў аўтаномію. *Ф.С.Фешчанка.*

**АРАГО́Н** (Aragon) Луі (3.10.1897, Парыж — 24.12.1982), французскі пісьменнік, паліт. дзеяч. Чл. Ганкураўскай акадэміі. Ганаровы д-р Маскоўскага і Пражскага ун-таў (1966). З 1915 вучыўся на мед. ф-це ў Парыжы. Удзельнік 1-й сусв. вайны, грамадзянскай вайны ў Іспаніі 1936—39, у 2-ю сусв. вайну — франц. Руху Супраціўлення. Раннія творы напісаны ў духу дадаізму (зб. вершаў «Феерверк», 1920; раман «Анісе, ці Панарама», 1921) і сюррэалізму (раман «Парыжскі селянін», 1926). На пачатку 1930-х г. перайшоў на пазіцыі рэалізму: зб-кі вершаў «Ура, Урал!» (1934), «Нож у сэрца» (1941), «Вочы Эльзы» (1942), цыкл раманаў «Рэальны свет» (1934—51), раман-эпапея «Камуністы» (т. 1—6, 1949—51, апошняя рэд. 1967—68), гіст. раман «Перадвелікодны тыдзень» (1958). Эпічны размах у спалучэнні з лірычнасцю і філас. роздумам характэрныя для раманаў «Пагібель усур'ёз» (1965), «Бланш, ці Забыццё» (1967), «Тэатр-раман» (1974). Апавяданні роз-

ных гадоў склалі зб. «Салгаць — праўду сказаць» (1980). У кн. «Савецкія літаратуры» (1955) А. уключыў раздзел пра бел. л-ру. Пераклаў на франц. мову вершы «А хто там ідзе?», «Я не паэта», урыўкі з паэмы «Над ракою Арэсай» Я.Купалы, верш П.Броўкі. Творы А. на бел. мову перакладалі Э.Агняцвет, Р.Барадулін, З.Колас, С.Ліхадзіеўскі, Н.Мацяш.

*Тв.:* Choix de poèmes. Moscou, 1959; Бел. пер. — Базельскія званы. Мн., 1937; Рус. пер. — Собр. соч. Т. 1—11. М., 1957—61; Поэзия. М., 1980.

*Літ.:* Балашова Т.В. Творчество Арагона. М., 1964.

**АРАГО́НСКАЯ РАЎНІ́НА**, міжгорная раўніна на ПнУ Пірэнейскага п-ва, у Іспаніі, паміж Пірэнеямі, Іберыйскімі і Каталонскімі гарамі. Даўж. каля 300 км, шыр. да 120 км. Паверхня — узгорыстая раўніна выш. да 250 м, паблізу гор да 500—700 м. З ПнЗ на ПдУ па А.р. цячэ р. Эбра. Клімат субтрапічны кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. 8 °С, ліп. 24 °С. Ападкаў 300—500 мм за год. Пераважае сухі стэп (раслінасць тыпу *гарыга*), месцамі паўпустыня. Даліна р. Эбра шчыльна заселена. На А.р. — г. Сарагоса.

Б.Аракчэеў. Хлеб. 1969.

**АРАГРА́ФІЯ** (ад грэч. oros гара + ...*графія*), раздзел *геамарфалогіі*, які вывучае ўзаемнае размяшчэнне хрыбтоў, узвышшаў, рачных далін, катлавін і інш. формаў рэльефу, займаецца таксама іх класіфікацыяй па знешніх прыкметах (памеры, вышыня, напрамак) незалежна ад паходжання.

**АРАГУА́Я** (Araguaia, Araguaya), рака ў Бразіліі, левы прыток р. Такантынс (сістэма р. Амазонка). Даўж. 2630 км, пл. бас. каля 370 тыс. км². Пачынаецца на паўд.-зах. ускраіне Бразільскага пласкагор'я, цячэ па ім з Пд на Пн, у сярэднім цячэнні разгаліноўваецца на 2 рукавы, утварае самы буйны рачны в-аў Бананал (даўж. больш за 300 км, шыр. 75 км). У нізоўі — парогі. Паўнаводная ў перыяд дажджоў (з ліст. да сакавіка). Сярэдні расход вады каля 8,5 тыс. м³/с. Суднаходная (у сярэднім цячэнні) на працягу 1300 км.

**АРА́Д** (Arad), горад на З Румыніі. Адм. ц. жудэца Арад. 191 тыс. ж. (1989). На р. Мурэш. Трансп. вузел. Машынабудаванне (вагона- і станкабудаванне), хім. (вытв-сць азотных угнаенняў), дрэваапр., тэкст., швейная, гарбарна-абуткавая, харч. прам-сць. У час рэвалюцыі 1848—49 у А. часова знаходзіўся ўрад *Л.Кошута*.

**АРА́ДЗЯ** (Oradea), горад на ПнЗ Румыніі. Адм. ц. жудэца Біхар. На Сярэднедунайскай нізіне, у даліне р. Крышул-Рэпедэ, 214 тыс. ж. (1986). Чыг. вузел. Машынабудаванне (у т.л. станкабудаванне), хім.-фармацэўтычная, мэблевая, тэкст., швейная, гарбарна-абуткавая, харч., паліграф. прам-сць. Вытворчасць гліназёму, буд. матэрыялаў.

**АРАДУ́Р-СЮР-ГЛАН** (Oradour-sur-Glane), пасёлак у Францыі ў дэпартаменце Верхняя В'ена. У 2-ю сусв. вайну 10.6.1944 поўнасцю знішчаны гітлераўцамі разам з яго жыхарамі (каля 1 тыс. чал.). Руіны А.-с.-Г. захаваны як гіст. сведчанне фаш. варварства, пасля вайны недалёка ад А.-с.-Г. пабудаваны новы пасёлак.

**АРАКАЖУ́** (Aracajú), горад на У Бразіліі. Адм. ц. штата Сержыпі. Засн. ў 1855. 418 тыс. ж. (1990). Міжнар. аэрапорт, чыг. станцыя. Цукр., тэкст., гарбарная прам-сць. Порт у вусці р. Сержыпі (вываз цукру, бавоўны, драўніны, сырых скур). Ун-т.

**АРАКА́НСКІЯ ГО́РЫ**, Ракхайн, Аракан-Йома, горы на З п-ва Індакітай, у М'янме. Працягласць каля 800 км. Выш. да 3053 м (г. Вікторыя). Сярэдневышынныя складкава-глыбавыя горы, утвораныя ў альпійскую складкавасць. Паралельныя мерыдыянальныя хрыбты з вострымі і стромкімі схіламі, падзеленыя эразійна-тэктанічнымі далінамі на Пн, пераходзяць на Пд у нізкагорныя ланцугі пакатых узвышшаў выш. 150—200 м. Складзены са сланцаў, кварцытаў, пясчанікаў, па перыферыі — з асадкавых парод. Карысныя выкапні: волава, вальфрам, свінец, золата, серабро, каштоўныя камяні. Наветраныя зах. схілы ўкрыты вільготнымі трапічнымі вечназялёнымі лясамі, падветраныя ўсх. — мусоннымі лістападнымі, на выш. 1000 м і больш — вечназялёнымі дубовымі і хваёвымі лясамі.

**АРА́КІ** Садао (26.5.1877—2.11.1966), японскі дзярж. і паліт. дзеяч, генерал (1933). У 1931—34 ваен. міністр, у 1938—39 міністр асветы. Адзін з гал. кіраўнікоў і ідэолагаў яп. імперыял. агрэсіі і фашызацыі краіны ў 1920—40-я г. У 1948 прыгавораны Міжнар. ваен. трыбуналам у Токіо да пажыццёвага турэмнага зняволення. Вызвалены ў 1955.

**АРАКІШВІ́ЛІ** (Аракчыеў) Дзмітрый Ігнатавіч (23.2.1873, Уладзікаўказ — 13.8.1953), грузінскі кампазітар, музыказнавец. Нар. арт. Грузіі (1929). Акад. АН Грузіі (1950). Скончыў Маскоўскае муз.-драм. вучылішча (1901), археал. ін-т (1917). Адзін з арганізатараў нар. кансерваторыі ў Маскве (1906). Праф. і дырэктар Тбіліскай кансерваторыі (з 1921). Адзін з заснавальнікаў груз. нац. муз. школы і фалькларыстыкі, стваральнік жанру груз. класічнага раманса. Сярод твораў: адна з першых груз. опер «Паданне пра Шата Руставелі» (1919), 3 сімфоніі, хары і інш. Сабраў і апублікаваў больш за 500 груз. нар. песень і інстр. мелодый. Аўтар прац аб груз. музыцы. Дзярж. прэмія СССР 1950.

**АРА́КС**, рака ў Закаўказзі (вярхоўі ў Турцыі, ніжняе цячэнне ў Азербайджане); правы прыток Куры. На значным працягу па А. праходзіць мяжа Арменіі і Азербайджана з Турцыяй і Іранам. Даўж. 1072 км, пл. бас. 102 тыс. км². Пачынаецца на схілах хрыбта Бінгёль, у вярхоўях цячэ ў вузкай глыбокай даліне, у сярэднім цячэнні (на Араратскай раўніне) даліна расшыраецца, рака падзяляецца на рукавы, нізоўі на Кура-Араксінскай нізіне. Жыўленне мяшанае. Разводдзе з сак. да чэрв., дажджавыя паводкі ў ліст.,— снежні. Сярэдні расход вады 285 м³/с. Штогод выносіць 16 млн. т наносаў. Выкарыстоўваецца на арашэнне. На А. азерб.-іранскі гідратэхн. комплекс.

**АРАКЧЭ́ЕЎ** Аляксей Андрэевіч (4.10.1769—3.5.1834), расійскі дзярж. і ваенны дзеяч. Генерал (1807), граф, даверaная асоба пры дварах Паўла I і Аляксандра I. З 1808 ваен. міністр, з 1810 старшыня ваен. дэпартамента Дзярж. савета. Ролю вышэйшай дзярж. установы набыла ўласная яго імператарскай вялікасці канцылярыя, якой у

1812—25 кіраваў А. З 1815 меў вызначальны ўплыў на Аляксандра І. Праводзіў рэакц. палітыку паліцэйскага дэспатызму і грубай ваен. сілы (гл. *Аракчэ-ёўшчына*).

**АРАКЧЭ́ЕЎ** Барыс Уладзіміравіч (н. 19.4.1926, в. Турбанава Брэйтаўскага р-на Яраслаўскай вобл.), бел. жывапісец, педагог. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1959). З 1971 выкладае ў Бел. акадэміі мастацтваў. Працуе ў станковым жывапісе. Яго творчасці ўласцівы жыццесцвярджальнасць, экспрэсіўная жывапісна-пластычная мова, кампазіцыйная завершанасць. Асн. работы: «Этапы вялікага шляху» (1959), серыя «Брэсцкая крэпасць» (1961—70), «Хлеб» (1969), «Гродзенскія гусары каля Полацка» (1995) і інш. Аўтар пейзажных кампазіцый: «Сакавік» (1964), «На сплаве» (1973), «Стары млын у Манькавічах» (1981), «Народныя песні» (1982), «Зямля заслаўская» (1985), «Ф.Скарына» (1990), «З думкай аб родных нівах. М.Багдановіч» (1991), «Вечар у Жыровічах» (1993). Адзін з аўтараў дыярамы «Мінскі кацёл» (1971, Бел. дзярж. музей гісторыі Вял. Айч. вайны).

*Г.А.Фатыхава.*

**АРАКЧЭ́ЕЎШЧЫНА**, палітычны рэжым у Расіі ў 1815—25 (назва ад прозвішча А.А.*Аракчэева*). Устаноўлены для ўмацавання абсалютызму ва ўмовах пашырэння грамадскага руху пасля вайны 1812. У дзяржаве панавалі самавольства, паліцэйскі дэспатызм і дэспатычны парадак у арміі, жорстка каралася любая праява незадаволенасці. Для прадухілення рэв. руху ў гарадах размяшчаліся вайсковыя каманды. Узмацнілася памешчыцкая эксплуатацыя сялян, жорстка душыліся выступленні сялян, у т.л. ў Брэсцкім і Пружанскім пав., Мазырскім старостве. Узмацнілася рэакцыя ў галіне асветы і культуры: праследаваліся прагрэс, матэрыялізм, думка, прагрэс. навукоўцы, забаронена дзейнасць масонаў (1822), пачаліся ганенні на т-вы *філаматаў* і *філарэтаў* (1823). Метады А. захаваліся і ў перыяд царавання Мікалая І. Слова «А.» стала сінонімам самавольства і паліцэйскіх метадаў кіравання.

**АРА́ЛІЯ** (Aralia), род кветкавых раслін сям. араліевых. 35 відаў. Пашыраны ў Паўн. паўшар'і. На Беларусі ў Цэнтр. бат. садзе АН інтрадукавана А. маньчжурская, або чортава дрэва (A. mandshurica), разводзіцца ў садах і парках.

Невялікія дрэвы або кусты і высокія травы. Сцябло густа ўкрытае вострымі калючкамі. Лісце няпарнаперыстае, на доўгіх чаранках. Кветкі дробныя, жоўта-белыя, сабраныя ў мяцёлчатыя суквецці. Плод — ягадападобная касцянка. Дэкар., харч. расліна. У каранях ёсць эфірны алей, смолы, сапаніны, вітаміны С, В, $B_1$; настой з іх ужываецца як танізоўны сродак (сурагат жэньшэню).

**АРА́Л-ПАЙГАМБА́Р**, запаведнік ва Узбекістане. Размешчаны на аднайм. пясчаным востраве (даўж. каля 8 км, шыр. каля 5 км) у рэчышчы Амудар'і каля г. Тэрмез у Сурхандар'інскай вобл. Пл. больш за 3 тыс. га, у т.л. 964 га пад лесам, 6 га — вадаёмы. Засн. ў 1960 з мэтай аховы і вывучэння прыродных комплексаў тугайных лясоў (туранга, лох, тамарыск) і чарацяных зараснікаў, а таксама для аднаўлення папуляцыі бухарскага аленя. Пашыраны індыйскі пласціністазубы пацук, заяц-пясчанік, дзік, шакал, у паўд. пустыннай частцы в-ва — сяроднеазіяцкая чарапаха, шэры варан, туранская гюрза, стэпавая агама, з птушак — чаплі, крыжанка, шэрая гусь, змеяед, чорны грыф, валасянкі, звычайны ляляк і інш.

**АРАЛСО́Р**, бяссцёкавае горка-салёнае возера ў Казахстане, на Прыкаспійскай нізіне. Пл. 101 км$^2$. Паклады саляноснай гразі — хакі. Здабыча солі.

**АРА́ЛЬСКАЕ МО́РА**, Арал (цюрк. арал — востраў), бяссцёкавае салёнае возера-мора ў Туранскай нізіне, на тэр. Казахстана і Узбекістана. Чацвёртае ў свеце возера па велічыні. Пл. 40 тыс. км$^2$ (у т.л. т. зв. Вялікага м. 37 тыс. км$^2$). Пераважныя глыб. 20—25 м, найб. 61 м. Паўн. бераг у асн. стромкі, зах. — высокі (да 250 м), абрывісты, паўд. і ўсх. берагі нізінныя. Больш як 300 а-воў (найб. Кокарал, Барсакельмес, Адраджэння). Упадаюць рэкі Амудар'я і Сырдар'я. Т-ра вады на паверхні летам 26—30 °С, зімой ад -2 да +2 °С. Ледастаў 4—5 мес, у суровыя зімы мора цалкам замярзае. З 1960-х г. узровень А.м. інтэнсіўна паніжаецца з-за ўзмоцненага расходу водаў Амудар'і і Сырдар'і на ірыгацыю. У 1980-я г. рачны сцёк складаў некалькі кубічных кіламетраў у год (пры 65 км$^3$/год да 1960-х г.), воды Сырдар'і, у асобныя гады і Амудар'і, не даходзяць да мора. Узровень А.м. да 1987 панізіўся амаль на 13 м, акваторыя скарацілася на 1/3. Адбылося аддзяленне меншай паўн.-ўсх. часткі А.м. (Малое м.) пл. 3 тыс. км$^2$. Салёнасць павялічылася з 10‰ да 27—30‰, воды моцна забруджаны с.-г. хімікатамі. На сухіх абшарах б. марскога дна ўзнікла пустыня Аралкум пл. 2,6 млн. га. Уздоўж марскога ўзбярэжжа працягнуліся ўзгоркі соды і сульфату магнію, якія разносяцца вятрамі і забруджваюць вял. плошчы. Рыбны промысел і марскія трансп. перавозкі спынены. Адбываюцца разбурэнне сацыяльна-эканам. структуры гасп. комплексу Прыаралля, збядненне прыродных рэсурсаў, пагаршаюцца ўмовы жыцця і здароўя насельніцтва. А.м. ператварылася ў зону экалагічнага бедства.

*В.П.Кісель.*

Аралія маньчжурская.

**АРА́М**, у армянскім эпасе — герой, продак армян, які абараняў межы арм. зямель, уступаў у барацьбу з Мідыяй, Асірыяй і Кападокіяй. Іншыя народы яго імем называюць краіну армян: грэкі — Армен, іранцы і сірыйцы — Армені.

**АРАМА́ЗД**, у армянскай міфалогіі вярхоўнае бажаство, тварэц неба і зямлі, бог урадлівасці. Яго эпітэт — «ары» (мужны). Гал. святілішча А. было ў культавым цэнтры стараж. Арменіі Ані (сучасны Камах на тэр. Турцыі).

**АРАМАРФО́З** (ад грэч. aiō padymaju + morphōsis узор, форма), анагенез, арагенез, морфафізіялагічны прагрэс, эвалюцыйнае пераўтварэнне марфалагічнай структуры і функцый арганізма, у выніку якога ён падымаецца на прынцыпова новую, больш прагрэсіўную ступень развіцця; адзін з асн. кірункаў біял. прагрэсу. Тэрмін увёў рус. вучоны А.М.Северцаў (1920). А. садзейнічае высокай жыццяздольнасці арганізма, павышэнню ўзроўню абмену рэчываў, развівае больш актыўныя спосабы барацьбы за існаванне і інш. Магчымасці А. рэалізуюцца ў працэсе развіцця *ідыяадаптацый* і інш. больш вузкіх прыстасаванняў, на базе якіх могуць фарміравацца новыя А. Напр., лёгкія для кісцяпёрых рыб (продкаў наземных пазваночных) былі ідыяадаптацыяй, што давала ім магчымасць існаваць у вадаёмах з паніжанай колькасцю растворанага кісларoду. Для іх патомкаў (наземных пазваночных) А. стала ўдасканаленне лёгачнага дыхання. Якасны скачок А. адбыўся пры пераходзе ад рэптыліяпадобных да млекакормячых: чатырохкамернае сэрца, унутрывантробны тып развіцця, узнікненне пёравага, валасянога покрыва і інш.

**АРАМАТЫЗА́ЦЫЯ**, 1) у нафтахіміі — перапрацоўка нафты, нафтапрадуктаў для павелічэння ў іх колькасці араматычных вуглевадародаў (бензолу і яго гамолагаў). Адбываецца за кошт ператварэння ацыклічных вуглевадародаў у цыклічныя, ізамерызацыі і дэгідравання нафтэнаў у розных працэсах перапрацоўкі нафты і яе

фракцый (*крэкінг*, *рыформінг*, *піроліз*). Выкарыстоўваецца ў выт-сці высокаактанавага паліва і чыстых араматычных вуглевадародаў. 2) У харчовай прамысловасці — увядзенне араматычных рэчываў у харч. прадукты і напіткі для павелічэння іх духмянасці і паляпшэння смаку. Праводзіцца з дапамогай натуральных (атрыманыя з *эфіраалейных культур*) і сінт. (духмяныя харч. эсенцыі) рэчываў.

**АРАМАТЫ́ЧНЫЯ ЗЛУЧЭ́ННІ**, цыклічныя арган. злучэнні, атамы якіх ствараюць адзіную спалучаную (араматычную) сістэму сувязяў. Назва ад прыемнага паху першых адкрытых такіх злучэнняў.

У вузкім сэнсе да А.з. адносяць толькі бензольныя злучэнні: араматычныя вуглевадароды (арэны), напр. бензол, талуол, стырол, бі-, тры- і поліцыклічныя злучэнні, пабудаваныя з бензольных ядраў, напр. нафталін, антрацэн, і іх вытворныя (галагензмяшчальныя, аміны, нітразлучэнні, фенолы і інш.). Фіз. і хім. асаблівасці А.з. звязаны з існаваннем у іх замкнёнай электроннай абалонкі з π-электронаў. У параўнанні з *ненасычанымі злучэннямі* яны больш устойлівыя, удзельнічаюць пераважна ў рэакцыях замяшчэння і захоўваюць араматычную сістэму сувязяў. У шырокім сэнсе да А.з. адносяць таксама гетэрацыклічныя электронныя аналагі бензолу (пірыдзін, пірол, фуран, тыяфен), небензоідныя злучэнні тыпу азуленаў, баразолу, ферацэну і інш. Асн. крыніца А.з. — прадукты каксавання каменнага вугалю, перапрацоўкі нафты (гл. *Араматызацыя*). А.з. — прадукты прамысл. арган. сінтэзу (паліамеры, фарбавальнікі, лекавыя сродкі, выбуховыя рэчывы).



Араматычныя злучэнні: 1 — бензол; 2 — талуол; 3 — стырол; 4 — нафталін; 5 — антрацэн.



Арамейскае пісьмо. Надпіс з аазіса Тэйма (Паўн. Аравія). Сярэдзіна 1-га тыс. да н.э.

**АРАМЕ́І**, арамейцы, качавыя семіцкія плямёны, выхадцы з Аравіі. Упершыню ўпамінаюцца ў сярэдзіне 3-га тыс. да н. э. У 14 ст. да н. э. трапілі ў Сірыйскую пустыню і на сярэдні Еўфрат, на мяжы 12—11 ст. да н. э. засялялі амаль усю Пярэднюю Азію. У асобных месцах (на У ад р. Іардан і інш.) А. сталі весці аселае жыццё. Арамейская мова да пач. н. э. стала асн. гутарковай мовай у Пярэдняй Азіі. Патомкі А. — сучасныя *асірыйцы*.

**АРАМЕ́ЙСКАЕ ПІСЬМО́**, складовае пісьмо кансанантнага тыпу. Узнікла на пач. 1-га тыс. да н. э. на аснове *фінікійскага пісьма*; фармальна — спрошчаная (курсіўная) яго форма. Алфавіт складаецца з 22 знакаў, кожны абазначае склад — «звычны + галосны (або нулявы галосны)», — да якога потым дадаюцца т. зв. matres lectionis (знакі для абазначэння доўгіх і канцавых галосных). Кірунак пісьма — справа налева. Першыя пісьмовыя помнікі А.п. датуюцца 9—8 ст. да н. э. У сярэдзіне 1-га тыс. да н. э. было пашырана ў Пярэдняй Азіі (дзелавое пісьмо Асірыі і Персіі), у 4 ст. н. э. знікла. Аснова большасці пісьмовых сістэм Пярэдняй і Цэнтр. Азіі. *А.А.Кожынава.*

Арангутан.

**АРАМЕ́ЙСКАЯ МО́ВА**, адна з *семіцкіх моў*. У 14—11 ст. да н. э. *арамеі* сяліліся ў Сірыі і Месапатаміі, адкуль А. м. распаўсюдзілася на ўвесь Б. Усход. Стараж. пісьмовыя помнікі датуюцца 9—8 ст. да н. э. У 7—4 ст. да н. э. А.м. — міжнародная мова Б. і Сярэдняга Усходу. На ёй напісаны асобныя часткі Біблії і Талмуда. Складалася са шматлікіх дыялектаў, у т.л. стараарамейскіх пальмірскага і набатэйскага, мандэйскага (мовы рэліг. кніг мандэйцаў 3—8 ст.), эдэскага, на аснове якога ўзнікла сірыйская, а пазней новасірыйская (асірыйская) мова. Пасля арабскіх заваяванняў паступова выцясняецца *арабскай мовай*. Некаторыя дыялекты А.м. ўжываюцца толькі ў асобных рэгіёнах Сірыі, Паўн. Месапатаміі, Ірака і Ірана. *Л.М.Ляшчова.*

**АРА́МКА**, гл. *Арабска-Амерыканская нафтавая кампанія.*

**АРА́Н**, арабская назва тэр. *Албаніі Каўказскай*. У пісьмовых крыніцах гэта назва сустракаецца з 6 ст., у 9—10 ст. так называлася пераважна стэпавая зона міжрэчча Куры і Аракса (сучасны Мільскі стэп) з гарадамі Барда, Ганджа і Байлакан.

**АРА́Н**, горад на ПнЗ Алжыра. Адм. ц. вілаі Аран. 590 тыс. ж. (1987). Буйны трансп. і гандл. цэнтр. Порт на Міжземным м. (гандаль віном, збожжам, воўнай, агароднінай, травой альфа). Харч., харчасмакавая (у т.л. тытунёвая), тэкст., абутковая, металаапр., хім., металургічная, цэментная прам-сць. Рамёствы. Ун-т. Музей ісламскага мастацтва. Крэпасць Санта-Крус (16 ст.), мячэць (18 ст.). Засн. каля 903. Месца высадкі саюзнага войска ў 2-ю сусв. вайну; былая франц. ваен.-марская база.

**АРАНГУТА́Н** (Pongo), род чалавекападобных малпаў сям. пангідаў атр. прыматаў. Адзіны від — А. звычайны (P. pygmaeus). Жыве ў забалочаных трапічных лясах а-воў Суматра і Калімантан.

Рост самцоў да 1,5 м, маса да 200 кг, самкі значна меншыя. Склад цела масіўны. Заднія канечнасці кароткія, пярэднія доўгія з размахам да 2,25 м. Вельмі развітая мускулатура. Цела ўкрытае рэдкімі валасамі чырвонакарычневага колеру, на плячах даўж. валасоў да 40 см. Жывуць на дрэвах, дзе будуюць гнёзды. Кормяцца пладамі (найчасцей дурыяну), птушанятамі, яйкамі. Нараджаюць 1 дзіцяня масай 1,5—2 кг, якое маці корміць малаком да 3—4 гадоў. Жывуць да 30 гадоў. Колькасць невялікая. Ахоўваецца.

**АРА́НЖАВАЯ** (Oranje, Orange), рака на Пд Афрыкі, у Лесота, ПАР і Намібіі. Даўж. 1860 км, пл. бас. 1020 тыс. км². Пачынаецца ў масіве Монт-а-Сурс (Драконавы горы) у Лесота пад назвай Сінку на выш. больш за 3000 м. Перасякае засушлівую вобласць Высокі Велд, плато Кап, дзе цячэ ў цясніне. У верхнім і сярэднім цячэнні парогі і вадаспады (Аўтрабіс і інш.). Апошнія 100 км цячэ па раўніне, упадае ў Атлантычны ак., утварае бар (пясчаны падводны вал). Гал. прытокі — Каледан і Вааль. Паўнаводная з ліст. да сакавіка. У межах Высокага Велда часам амаль перасыхае. Сярэдні расход вады 800 м³/с. Гадавы сцёк каля 15 км³ (моцна мяняецца па гадах). Выкарыстоўваецца на

водазабеспячэнне і арашэнне (пабудаваны арашальныя сістэмы). ГЭС. На А. буйныя гарады: Алівал-Норт, Прыска, Апінгтон (ПАР). *З.Я.Андрыеўская.*

**АРА́НЖАВАЯ ПРАВІ́НЦЫЯ**, Аранжавая Рэспубліка (англ. Orange Free State), правінцыя ў цэнтр. ч. Паўд.-Афрыканскай Рэспублікі. Мяжуе з прав. Капская, Трансвааль і Наталь, на ПдУ — з Лесота. Пл. 129,2 тыс. км², нас. 1,8 млн. чал. (1985). Насельніцтва — банту і сута. Адм. ц. — г. *Блумфантэйн*. А.п. займае ч. ўнутраных плато — на З Плато Кап, якое на У пераходзіць у Высокі Велд і Драконавы горы (выш. да 2300 м). Клімат субтрапічны, ападкаў 250—900 мм за год. Бываюць замаразкі і засухі. Рака Аранжавая з прытокамі Вааль і Каледан упадае ў Атлантычны ак., на ёй ГЭС і вадасховішчы. Здабываюць золата, уранавыя руды і алмазы. Развіты маш.-буд., металаапр., металургічная (каляровыя металы), хім., гарбарна-абутковая, харч. прам-сць. У сельскай гаспадарцы пераважае пашавая жывёлагадоўля (буйн. раг. жывёла, авечкі). Земляробства на багатых глебах (кукуруза, пшаніца, агародніна, тытунь, цытрусавыя). Транспарт чыг. і аўтамабільны.

Першыя сем'і афрыканераў (бураў) на тэр. А.п. з'явіліся ў 1830-я г. Пераадолеўшы супраціўленне карэнных жыхароў — плямёнаў басута, яны заснавалі ў 1837 самаст. дзяржаву. У 1854 буры абвясцілі стварэнне Аранжавай Свабоднай дзяржавы. У саюзе з Трансваалем яна ўдзельнічала ў *англа-бурскай вайне 1899—1902*. З 1900 — брыт. калонія, у 1907 атрымала самакіраванне. З 1910 разам з трыма інш. калоніямі ў складзе Паўд.-Афрыканскага Саюза (з 1961 ПАР).

**АРА́НЖАВАЯ СВАБО́ДНАЯ ДЗЯРЖА́ВА**, гл. ў арт. *Аранжавая правінцыя*.

**АРАНЖАРЭ́Я** (франц. orangerie), зашклёнае памяшканне для вырошчвання і зімоўкі паўд. раслін (цытрусавых, кветкавых, вечназялёных, пладова-ягадных і інш.). А. добра асвятляюцца, маюць неабходны рэжым тэмпературы, вільготнасці і ўмовы для догляду раслін. Бываюць 1- і 2-схільныя, блочныя, ангарныя.

**АРАНЖЫРО́ЎКА** (франц. arranger літар. прыводзіць у парадак), 1) пераладжэнне муз. твора для інш. складу выканаўцаў або для выканання на іншым, чым прадугледжана арыгіналам, інструменце (інструментах). Існуюць пераладжэнні опер, сімфоній, камерных ансамбляў для фартэпіяна, радзей вакальных і інстр. твораў для аркестра. 2) Палегчанае пераладжэнне муз. твора для выканання на тым самым інструменце. 3) У джазавай музыцы А., як правіла, элемент *імправізацыі*. Пад А. для аркестра разумеюць апрацоўку муз. тэматызму, зафіксаваную ў нотным тэксце. Для невял. ансамбляў характэрна «вусная» А., без нотнага запісу, заснаваная на імгненнай каардынацыі намаганняў асобных выканаўцаў. *І.Дз. Назіна.*

**АРА́НСКАЯ КУЛЬТУ́РА**, іберамаўрская культура, археалагічная культура плямёнаў канца верхняга палеаліту, якія 12—10 тыс. г. таму назад насялялі ўзбярэжныя раёны Марока, Алжыра і Туніса. Назва ад стаянкі каля г. Аран (Алжыр). Для А.к. характэрны крамянёвыя пласціны з прытупленым краем і прылады з адшчэпаў, сустракаюцца касцяныя шылы, долаты, каменныя падвескі, прасвідраваныя ракавіны і інш. вырабы.

**АРА́НЧЫЦЫ**, вёска ў Беларусі, у Ліноўскім с/с Пружанскага р-на Брэсцкай вобл. За 12 км на Пд ад Пружан, 75 км ад Брэста. Чыг. станцыя на лініі Мінск—Брэст. 939 ж., 369 двароў (1995). Птушкафабрыка, збожжапрыёмнае прадпрыемства, міжраённая гандл. база, Пружанскае райаграпрамзабеспячэнне, сярэдняя школа, б-ка, клуб. Помнік архітэктуры 20 ст. — Крыжаўзвіжанская царква.

**АРАНШТА́М** Лазар Навумавіч (21.6.1896, г. Рамны Сумскай вобл., Украіна — 1939), дзеяч рэв. руху ў Зах. Беларусі. У грамадз. вайну камісар дывізіі, інспекцыі артылерыі Чырв. Арміі. З 1924 на падп. рабоце ў Зах. Беларусі: сакратар ЦК КПЗБ, чл. ЦК КПП. З 1928 у СССР. З 1929 чл. РВС і нач. Палітупраўлення БВА. З 1933 нач. Палітупраўлення і нам. камандуючага Асобай Далёкаўсх. арміяй. Чл. ЦК у 1929—33 і чл. Бюро ЦК КП(б)Б у 1930—33. Чл. Цэнтр. рэвіз. камісіі ВКП(б) у 1930—37. Чл. ЦВК БССР у 1924, 1929—34, чл. ЦВК СССР у 1929—31. Рэпрэсіраваны. Рэабілітаваны ў 1956.

Аранжарэя батанічнага комплексу ў Сан-Антоніо (ЗША). Арх. Э. Амбаш. 1988.

**АРА́НЬЕСТАД** (Oranjenstad), горад, адм. ц. *Аруба* (архіпелаг М.Антыльскіх а-воў). 20 тыс. ж. (1988). Гавань. Міжнар. аэрапорт Куін Беатрыкс. Ачыстка нафты. Суднарамонтнае прадпрыемства. Турызм.

**АРАРА́Т** [тур. (Büyük) Ağrı Dağı, арм. Масіс], самы высокі вулкан Армянскага нагор'я на У Турцыі каля мяжы з Арменіяй і Іранам. Два злучаныя асновамі конусы — Вялікі А. (выш. 5165 м) і Малы А. (выш. 3925 м). Складзены з базальтаў. На схілах каля 30 ледавікоў. Лічыцца месцам прычальвання Ноевага каўчэга.



Да арт. **Арарат**. Гара Вялікі Арарат.

**АРАРА́ЦКАЯ РАЎНІ́НА**, на Каўказе, па сярэднім цячэнні р. Аракс, паміж гарамі Арарат на Пд і Арагац на Пн. Б. ч. раўніны знаходзіцца ў Арменіі, меншая — у Турцыі. Даўж. 90 км, выш. 850—1000 м. Раён паліўнога земляробства (вінаград і інш. культуры). Неўзараныя ўчасткі захавалі ландшафты пераважна салянкавай паўпустыні. На Пн раўніны гарады Ерэван, Актэмберан, Эчміядзін.

**АРА́СКАЯ У́НІЯ 1579**, пагадненне пра аб'яднанне валонскіх правінцый на Пд Нідэрландаў (Эно, Артуа, Дуэ), заключанае па ініцыятыве рэакц. каталіцкага дваранства. У выніку на пэўных умовах аднаўлялася ісп. панаванне над правінцыямі. Накіравана фактычна супраць нац.-выз. вайны з Іспаніяй у ходзе *Нідэрландскай буржуазнай рэвалюцыі* 16 ст. У адказ сем рэв. правінцый на Пн Нідэрландаў заключылі *Утрэхцкую унію*. Аформлена 6 студз. ў Арасе (прав. Артуа); пазней да А.у. далучыліся прав. Ліль, Аршы і інш.

**АРА́Т з Сікіёна** (Aratos Sikyōnios; 271—213 да н. э.), дзяржаўны дзеяч Стараж. Грэцыі. Прыйшоў да ўлады ў 251, скінуўшы тырана г. Сікіён. Дамог-

ся ўключэння горада ў *Ахейскі саюз*. З 245 больш як 17 разоў выбіраўся стратэгам (кіраўніком) саюза, які пры ім дасягнуў росквіту і стаў незалежны ад Македоніі. У 224 уступіў у саюз з Антыгонам III Дасанам супраць Спарты. У 221 саюзнікі перамаглі спартанцаў, але Ахейскі саюз зноў трапіў у залежнасць ад Македоніі. Аўтар запісак (не захаваліся), якія былі выкарыстаны ў працах Палібія і Плутарха.

**АРАТА́ЛІТ**, у старажытнаарабскай міфалогіі адно з галоўных божастваў. Геродот лічыць А. і багіню *Алат* адзінымі багамі, якіх шанавалі арабы, атаясамліваючы А. з *Дыянісам*.

**АРА́ТАРСКАЯ ПРО́ЗА**, помнікі красамоўства, а таксама літаратурныя творы, напісаныя ў прамоўніцкім стылі. Найб. росквіту дасягнула ў Грэцыі (5—4 ст. да н. э.) і Рыме (1 ст. да н. э.), дзе выпрацавана тэорыя аратарскага мастацтва — *рыторыка*. Узоры класічнага красамоўства — прамовы Цыцэрона, буйнейшага тэарэтыка і практыка А.п. У перыяд сярэднявечча мела пераважна царкоўна-рэліг. характар. Эпоха Адраджэння садзейнічала развіццю свецкай А.п. На Беларусі першыя выдатныя прадстаўнікі царк. красамоўства Іларыён і Кірыла Тураўскі. Жанравую сувязь з А.п. мае *«Слова пра паход Ігараў»*. У 16—17 ст. у перыяд рэліг. палемікі бытавалі «слова», прамова, *казанне*, пропаведзь. Развіццю А.п. садзейнічалі і *арацыі*. Выдатным прамоўцам быў грамадска-паліт. дзеяч і дыпламат Л. Сапега (прамова на Варшаўскім сейме 1588). Сярод прадстаўнікоў бел. царк. красамоўства вылучаліся Л.Карповіч, М.Сматрыцкі і Сімяон Полацкі. У 17—18 ст. на Беларусі з'явіліся гумарыстычна-парадыйныя і сатыр. творы, складзеныя ў прамоўніцкім стылі (*«Прамова Мялешкі»*, *«Прамова русіна»*, Жыровіцкія арацыі і інш.). У стылі прамоў напісаны публіцыст. маналогі, «словы» да чытачоў К.Каліноўскага ў газ. «Мужыцкая праўда». У А.п. 20 ст. пакінуў след сваімі палкімі прамовамі ў польскім сейме Б.Тарашкевіч, які выступаў у абарону нац. і сац. правоў працоўных Зах. Беларусі. Цесна звязаныя з надзённымі праблемамі грамадскага жыцця творы А.п. — каштоўная крыніца ведаў пра культ. і гіст. мінулае краіны.

*В.А.Чамярыцкі.*

**АРАТО́РЫЯ** (італьян. oratorio ад лац. ого гавару, малю), буйная шматчасткавая кампазіцыя для спевакоў-салістаў (часам чытальніка), хору і сімф. аркестра пераважна эпіка-драм. характару, прызначаная для канцэртнага выканання. Мае агульныя рысы з *операй* (сюжэт, наяўнасць арый, рэчытатываў, ансамбляў, хароў), адрозніваецца ад яе адсутнасцю акцёрскай ігры, дэкарацый (як выключэнне бываюць сцэнічныя А.), перавагай апавядальнасці над драм. дзеяннем. У параўнанні з *кантатай* мае большыя памеры, ярка выражаную сюжэтную аснову.

Зарадзілася на мяжы 16—17 ст. ў Італіі. Напачатку А. пісалі на біблейскія, евангельскія або ант. сюжэты. Росквіт жанру ў 18 ст. звязаны з творчасцю Г.Ф.Гендэля, які стварыў класічны тып манум. гераіка-эпічнай А., і І.С.Баха, чые *пасіёны* (страсці) насычаны глыбокім філас. зместам. Пад уплывам асаблівасцяў розных нац. культур А. мадыфікавалася. Адбывалася яе сімфанізацыя (кампазітары венскай класічнай школы) або лірызацыя (кампазітары-рамантыкі). У 20 ст. адрадзілася цікавасць да А., якая інтэнсіўна збліжаецца з операй, кантатай, сімфоніяй.

У бел. музыцы першыя А. створаны ў 1930-я г. (блізкая да А. вак.-сімф. паэма «Над ракою Арэсай» М.Аладава, незакончаная А. «Вызваленне» Я.Цікоцкага). У 1960-я г. напісаны А. «Песня пра Кубу» С.Картэса, «Званы» Я.Глебава, «Мы — беларусы» К.Цесакова, першая камерная А. «Песні Хірасімы» (для чытальніка, салістаў — барытона

Араўкарыя даўгалістая: галінка з мікрастробілам (мужчынская шышка) і жаночая шышка (справа).

і сапрана і 2 фп.) Дз.Смольскага. З 1970-х г. бел. А. вылучаюцца разнастайнасцю тэматыкі і жанравымі разнавіднасцямі. Сярод найб. значных А. «Мая Радзіма» Смольскага, «Свяці, зара» Глебава, «Зямля Беларусі» У.Дарохіна (сл. П.Броўкі), «Памяці паэта» Картэса і «Паэт» Смольскага на вершы Я.Купалы, «Памяць Хатыні» В.Войціка, «Хатынь» Цесакова, «Ванька-Устанька» (сл. Я.Еўтушэнкі) і «Вольнасць» паводле кн. А.Радзішчава «Падарожжа з Пецярбурга ў Маскву» А.Мдывані. У 1980 — пач. 1990-х г. створаны А. «Бітва за Беларусь» А.Багатырова, «Думкі рускія» А.Бандарэнкі, «Лісткі з календара» (сл. М.Танка) А.Залётнева, «Сказ пра Ігара» і «Іканастас» Л.Шлег, «Куранты» В.Капыцько, «Зорка паэта» Э.Наско, «Беларускае вяселле» Цесакова, «Партызанскія песні» У.Алоўнікава і інш.

Большасць бел. А. ярка публіцыстычныя, напоўненыя грамадз. пафасам. Для іх характэрны апора на бел. паэзію, прыёмы развіцця, інтанацыйныя і ладавыя асаблівасці бел. муз. фальклору, увядзенне нац. інструментаў. У шэрагу А. выкарыстаны новыя сродкі выразнасці, у т.л. прыёмы моўнай дэкламацыі з фіксаванымі гукавышыннай лініяй і рытмам, санорныя эфекты, элементы алеаторыкі, серыйнай тэхнікі, падпарадкаваныя маст. мэтам.

*Літ.:* Розенов Э.К. Очерк истории оратории // Розенов Э.К. Статьи о музыке: Избр. М., 1982; Кулешова Г.Г. Белорусская кантата и оратория. Мн., 1987.

*А.У.Валадковіч.*

**АРАТРО́Н**, электравакуумная прылада, у якой кінетычная энергія электронаў пераўтвараецца ў энергію звышвысокачастотнага поля адкрытага рэзанатара. Тэорыя распрацавана сав. фізікам Ф.С.Русінам (1966). Выкарыстоўваецца як высокастабільны генератар эл.-магн. ваганняў міліметровага і субміліметровага дыяпазонаў з нізкім узроўнем шумаў. Асн. параметры: даўж. хвалі 0,1—100 мм, выхадная магутнасць да 10 Вт, перастройка частаты да 30%.

**АРА́ТЫ**, жывёлаводы ў Манголіі і раёнах пасялення манголаў у Кітаі; працоўныя ўвогуле, народ. А. наз. сяляне ў Рэспубліцы Тыва (Расійская Федэрацыя).

**АРА́ЎХА** (Araujo) Лойпа (н. 27.5.1941, Гавана), кубінская артыстка балета. Пасля заканчэння школы пры трупе «Балет Алісіі Алонса» (1956) артыстка трупы, з 1966 і 1978 вядучая салістка Нац. балета Кубы, у 1974—77 — Марсельскага балета пад кіраўніцтвам Р.Пці. Сярод партый: Адэта — Адылія («Лебядзінае возера» П.Чайкоўскага), Жызэль («Жызэль» А.Адана), Вівета («Арлезіянка» на муз. Ж.Бізэ) і інш. Лаўрэат міжнар. конкурсаў балета ў Варне (1965), Маскве (1965), Парыжы (1970).

**АРАЎКА́НЫ** (саманазва мапуча), індзейскі народ у Чылі (750 тыс. чал.; 1987) і на З Аргенціны (50 тыс. чал.). Гавораць на араўканскай мове. Прытрымліваюцца традыц. вераванняў.

**АРАЎКА́РЫЯ** (Araucaria), род голанасенных раслін сям. араўкарыевых. Каля 18 відаў. Пашыраны ў Паўд. Амерыцы, Аўстраліі, на астравах Ціхага ак. Найб. вядомыя А. высокая, чылійская і бразільская (культывуюцца як дэкар. на Чарнаморскім узбярэжжы Каўказа і Крыма). На Беларусі А. высокую вырошчваюць у пакоях і аранжарэях.

Хвойныя, пераважна двухдомныя дрэвы, звычайна з плоскай парасонападобнай кронай, выш. да 60—75 м і дыям. ствала да 2,5 м. Галінкі кальчакаватыя, гарызантальна распасцёртыя. Кара тоўстая, баразнаватая, смалістая. Лісце размешчана спіральна, плоскае, скурыстае, ад ланцэта- да шырокаяйцападобнага, часам іголкападобнае, даўж. 4—10 см. Мікрастробілы («мужчынскія шышкі») цыліндрычныя, буйныя — даўж. да 20—25 см і дыям. да 4—5 см. Жаночыя шышкі авальныя, дыям. 7—35 см. Насенне арэхападобнае, з крыльчатай лускавінкай, у некато-

рых відаў ядомае. Драўніна выкарыстоўваецца ў буд-ве, на выраб мэблі, муз. інструментаў, паперы і інш., смала — як лекавы сродак.

**АРАФА́Т** Ясір (н. 4.8.1929, г. Іерусалім), лідэр нац.-вызв. руху Палесціны, старшыня (з 1969) Выканкома *Арганізацыі вызвалення Палесціны* (АВП). Скончыў Каірскі ун-т (1955). Адзін з заснавальнікаў (1956) і кіраўнікоў (з 1965) палесцінскай арг-цыі аль Фатах, вярх. галоўнакаманд. ўзбр. сіламі Палесцінскага руху супраціўлення (з 1970). У сак. 1989 прызначаны Выканкомам АВП прэзідэнтам Дзяржавы Палесціна, абвешчанай на сесіі Нац. савета Палесціны (парламент у выгнанні) у ліст. 1988 у г. Алжыр. У 1993 падпісаў ізраільска-палесцінскае пагадненне аб узаемапрызнанні АВП і Ізраіля і аўтаноміі Палесціны. Нобелеўская прэмія міру (1994, з І.*Рабінам* і Ш.*Перасам*).

**АРАФУ́РСКАЕ МО́РА** (англ. Arafura Sea), у Індыйскім ак., паміж Аўстраліяй, Новай Гвінеяй і а-вамі Танімбар і Кай (Інданезія). Пл. 1017 тыс. км². Сярэдняя глыб. каля 200 м, найб. 3680 м. Утварае вялікі зал. Карпентарыя. У паўн. частцы А.м. — а-вы Ару і інш. Клімат субэкватарыяльны. Сярэдняя т-ра вады ад 25 да 28 °С. Салёнасць 34—35‰. Прылівы паўсутачныя, выш. 2,5—7,5 м. Здабыча жэмчугу, лоўля крабаў. Порт Дарвін (Аўстралія).

**АРАХІДО́НАВАЯ КІСЛАТА́**, вітамін $FCH_3(CH_2)_4(CH{=}CHCH_2)_4(CH_2)_2CO{-}OH$, ненасычаная вышэйшая кіслата. Прысутнічае ў раслінных алеях, у складзе ліпідаў жывёльных тканак (у фосфаліпідах наднырачнікаў каля 20% ад тлустых к-т). Бясколерная, масляністая вадкасць; малекулярная маса 304,46; $t_{пл}$ 49,5 °С; лёгка акісляецца кіслародам паветра. Належыць да незаменных карбонавых тлустых к-т. Разам з гома-γ-ліналенавай к-той з'яўляецца першаснай крыніцай *простагландзінаў*.

**АРА́ХІС** (Arachis), род кветкавых раслін сям. бабовых. Каля 30 відаў у тропіках Паўд. Амерыкі. Як харч. і алейная расліна пашырана ў трапічным, субтрапічным і менш ва ўмераным пясах. Культывуецца А. культурны, або земляны (кітайскі) арэх (A. hypogaea). На Беларусі ёсць у калекцыі Цэнтр. бат. сада АН, вырошчваецца аматарамі.

Аднагадовая травяністая расліна выш. 25—75 см. Сцябло прамастойнае або распасцёртае па зямлі. Лісце нянарнаперыстае. Кветкі жоўта-аранжавыя, верхнія бясплодныя, ніжнія пладаносныя, клейстагамныя. Пасля апладнення кветаножка з завяззю пачынае расці, апускаецца да зямлі і заглыбляецца ў глебу, дзе выспявае плод — цыліндрычны або коканападобны струк з сеткаватай паверхняй і 1—7 зярнятамі, багатымі бялком (да 22%), алеем (да 42%), вугляводамі (да 13%) і вітамінам $B_1$; мае ў сабе алкалоід арахін. Зярняты выкарыстоўваюцца на алей, кандытарскія вырабы, спажываюцца свежыя і падсмажаныя. З макухі робяць халву. Надземная маса — корм для жывёлы і сідэрат.

**АРА́ХІСАВЫ АЛЕЙ**, алей з земляного арэха (*арахісу*). Вадкасць бясколерная ці зеленавата-жоўтага колеру, t застывання ад 3 да -5 °С, шчыльн. 0,91—$0{,}92{\cdot}10^3$ кг/м³, не растваральны ў вадзе; невысыхальны. Мае 13—23% насычаных кіслот ($C_{14}$—$C_{24}$), 39—70% алеінавай і 13—38% лінолевай кіслот. Выкарыстоўваецца як самастойны харч. прадукт і ў вытв-сці маянэзаў, маргарыну, мыла, мед. мазяў.

**АРА́ХНА**, у грэчаскай міфалогіі лідыйская дзяўчына-рукадзельніца, мастацтвам якой захапляліся німфы р. Пактола. На спаборніцтва ў ткацтве яна выклікала *Афіну*, але тая ператварыла А. ў павука, які няспынна тчэ сваю павуціну. Гэты сюжэт выкарыстаны ў карцінах П.Рубенса, Я.Тынтарэта, П.Веранезе і інш.

**АРАХНАІДЫ́Т** (ад грэч. arachnē павук, павуціна + eidēs падобны + ...*іт*), запаленне мяккіх мазгавых абалонак (пераважна павуціннай) галаўнога або спіннога мозга чалавека. Узнікае як

Арахіс культурны.

ускладненне інфекц. хвароб (грып, вострыя рэспіраторныя, пнеўманія, адзёр і інш.), ачагоў факальнай інфекцыі, пры інтаксікацыі, чэрапнамазгавых траўмах. Прыкметы А. галаўнога мозга (цэрэбральны А.): галаўны боль з млоснасцю, ірвотай, галавакружэнне, сутаргі, зніжэнне памяці, хуткая стамляльнасць, вегетатыўныя расстройствы, аднабаковае зніжэнне слыху з парэзам мімічнай мускулатуры на тым жа баку, хутка прагрэсіруючае зніжэнне зроку (да слепаты); выяўляюцца лёгкія або сярэдне выражаныя ачаговыя прыкметы пашкоджання галаўнога мозга. Пры А. спіннога мозга (спінальным А.) пашкоджваюцца нерв. карэньчыкі, інш. раз рэчывы спіннога мозга. Узнікаюць апаразвальныя болі ў вобласці тулава, якія аддаюць у адну ці абедзве нагі, слабасць у нагах. Лячэнне ўключае санацыю ачагоў факальнай інфекцыі, процізапаленчыя, дэсенсібілізоўныя, рассысальныя, агульнаўмацавальныя, седатыўныя сродкі; пры паказаннях зніжаюць унутрычарапны ціск; у некаторых выпадках робяць хірург. аперацыі. Пры своечасовым лячэнні А. праходзіць.

*Г.Г.Шанько.*

Я.Арафат.

**АРАХНАЛО́ГІЯ** (ад грэч. arachnē павук + ...*логія*), раздзел *заалогіі*, які вывучае *павукападобных*. Вылучылася ў самастойную дысцыпліну ў сувязі з вял. пашырэннем павукападобных у свеце, стратамі, якія яны наносяць сельскай гаспадарцы, а таксама з небяспечнасцю для здароўя чалавека і жывёл ядавітых павукападобных, розных відаў кляшчоў — узбуджальнікаў і пераносчыкаў хвароб. Распрацоўка тэарэт. асноў А. звязана з імёнамі рус. вучоных М.А.Халадкоўскага, Я.М.Паўлоўскага, А.А.Бялыніцкага-Бірулі, У.М.Беклямішава. На Беларусі развіваецца з 1920-х г.; найб. ўвага аддаецца вывучэнню кляшчоў (гл. *Акаралогія*). Навукова-даследчая работа вядзецца ў ін-тах АН Беларусі (заалогіі, лесу), НДІ эксперым. ветэрынарыі, эпідэміялогіі і мікрабіялогіі, ВНУ. Вывучаюцца відавы склад, экалогія і ўплыў антрапагенных фактараў на згуртаванне павукападобных. Распрацоўваюцца практычныя мерапрыемствы па ахове чалавека, жывёл і раслін ад шкодных павукападобных і выкарыстанні карысных відаў.

*І.У.Рачкоўская.*

**АРАХНО́ЗЫ** [ад грэч. arachnē павук + ...*оз*(ы)], хваробы жывёл і чалавека, якія выклікаюцца ядавітымі і паразітычнымі павукападобнымі (пераважна кляшчамі). З ядавітых павукоў асабліва небяспечныя *тарантул*, *каракурт*; сярод А., якія выклікаюцца кляшчамі (акарозаў), шырока вядомы *кароста*, многія *дэрматозы*. Асабліва цяжка хварэюць маладыя і знясіленыя жывёлы.

**АРАХО́ЎСКІ** Мікола (Мікалай Аляксандравіч; н. 3.7.1950, в. Сялец Бярозаўскага р-на Брэсцкай вобл.), бел. пісьменнік. Вучыўся ў Мінскім маст. вучылішчы (1966—68), Бел. тэатр.-маст. ін-це (1974—76). З 1977 паралізаваны. Друкуецца з 1979. Дэбютаваў п'есамі для лялечнага тэатра, адна з іх («Калі

дракон прачнуўся», 1982) прысвечана праблемам экалогіі. У драме «Машэка» (1988) праз самабытнае раскрыццё характараў і псіхалогіі ўладара, раба і незалежнага чалавека паставіў актуальную праблему пра згубны ўплыў улады на асобу. Дзеянне твора афарбавана з'яўленнем фантаст. прывідаў, часам пераходзіць у сферу ірэальнага. У драме абсурду «Ку-ку» (1992, 1-я прэмія на Рэсп. конкурсе драматургіі 1992) пераплецена рэальнае і ўяўнае, звычайнае і свет фантазій. Аўтар апавяданняў, казак, артыкулаў. *І.У.Саламевіч.*

**АРА́ЦЫІ** (ад лац. ого гавару), празаічны жанр у літаратуры Беларусі 17—18 ст.; своеасаблівыя тэатралізаваныя паказы-прамовы ў *школьным тэатры*. З А. выступалі шкаляры ў час розных святаў (Каляды. Вялікдзень), на т. зв. школьных сеймiках, дзе парадзіраваліся шляхецкія павятовыя сеймікі, і ў сувязі з заканчэннем навуч. года, каб прадэманстраваць поспехі ў красамоўстве. Прамоўцы гаварылі на польск. і бел. мовах. Тэатралізаваныя А. наладжваліся ў Жыровіцкай базыльянскай школе (Слонімскі р-н Гродзенскай вобл.) і школьным т-ры пры ёй (1751—56 і 1761), Забельскім дамініканскім калегіуме (в. Валынцы, Верхнядзвінскі р-н Віцебскай вобл.; 1780-я г.). Лепшыя А. распаўсюджваліся ў рукапісных зборніках, садзейнічалі развіццю аратарскай прозы на Беларусі.

*Літ.*: Мальдзіс А.І. Таямніцы старажытных сховішчаў. Мн., 1974. *А.І.Мальдзіс.*

**АРАША́ЛЬНАЕ ЗЕМЛЯРО́БСТВА**, вырошчванне с.-г. культур ва ўмовах штучнага *арашэння*; адзін з відаў інтэнсіўнага *земляробства*. Пашырана ў засушлівых зонах. Шырока выкарыстоўваецца таксама ў зоне дастатковага ўвільгатнення, дзе ёсць дэфіцыт вільгаці з-за нераўнамернага выпадання атм. ападкаў у асобныя перыяды вегетацыі. Пры А.з. прадукцыйнасць зямлі ў 1,5—3 разы вышэйшая, ураджаі найб. стабільныя. У А.з. выкарыстоўваюць метады паверхневага арашэння (паліванне па барознах), *дажджавання*, падглебавага ўвільгатнення, кропельнага і імпульснага арашэння (у асн. для агародніннных культур). Ва ўмовах Беларусі выкарыстоўваюць пераважна пры вырошчванні агародніннных культур, а таксама на культурнай пашы і сенажацях.

**АРАША́ЛЬНАЯ СІСТЭ́МА**, зямельная тэрыторыя з комплексам размешчаных на ёй гідратэхн. збудаванняў, прызначаных для *арашэння*. Уключае крыніцу вады, водазабор, водаправодную і водаразмеркавальную сетку, прыстасаванні для пераводу вады з праточнага стану ў глебавыя вільгацезапасы, прылады і




Схема арашальнай сістэмы з дажджаваннем: 1 — вадаём (рака); 2 — водазабор (помпавая станцыя); 3 — водаправодная сетка (падземны напорны трубаправод); 4 — водаразмеркавальная сетка (напорныя трубаправоды); 5 — дажджавальныя машыны кругавога дзеяння; 6 — дажджавальныя машыны франтальнага дзеяння; 7 — гідранты для далучэння дажджавальнай машыны; 8 — стацыянарныя дажджавальныя апараты.

абсталяванне для кіравання арашэннем, дапаможныя збудаванні.

Адрозніваюць А.с.: самацёчныя (арашальныя землі ніжэй за ўзровень вады ў вадаёме) і з мех. водападыманнем (арашальны масіў вышэй за ўзровень вады); адкрытыя (каналы і латкі), закрытыя (напорныя і безнапорныя трубаправоды) і камбінаваныя; з паверхневым паліваннем (вада размяркоўваецца па паверхні поля напускам, па палосах, па барознах), з дажджаваннем (вада распырскваецца над полем у выглядзе дажджу) і ўнутрыглебавыя (вада падаецца па поласцях у падворыўным гарызонце). Выкарыстоўваюцца таксама сістэмы дробнадысперснага (аэразольнага) увільгатнення, якія дробна распыляюць ваду ў прыземным слоі паветра, і сістэмы падглебавага ўвільгатнення, якія рэгулююць узровень грунтавых водаў з мэтай увільгатнення кораненаселенага слоя капілярнай вільгацюю. На Беларусі найбольш пашыраны сістэмы падглебавага ўвільгатнення і сістэмы з дажджаваннем. *А.П.Ліхацэвіч.*

**АРАШО́НКАВА** Ганна Уладзіміраўна (н. 21.11.1928, б. маёнтак Альба, Нясвіжскі р-н Мінскай вобл.), бел. моваznавец. Канд. філал. н. (1959). Скончыла БДУ (1953). З 1956 у Ін-це моваznаўства АН Беларусі. Даследуе сучасную бел. мову і культуру мовы, лексікаграфію, дыялекталогію. Сааўтар прац «Дыялекталагічны атлас беларускай мовы» (1963) і «Лінгвістычная геаграфія і групоўка беларускіх гаворак» (кн. 1—2, 1968—69; Дзярж. прэмія СССР 1971), «Агульнаславянскі лінгвістычны атлас» (вып. 1, 1988); «Беларуская граматыка» (ч. 1, 1985); «Слоўнік беларускай мовы» (1987), «Слоўнік цяжкасцей беларускай мовы» (1987) і «Кароткі слоўнік беларускай мовы» (1994, абодва з В.П.Лемцюговай); «Руска-беларускі слоўнік сельскагаспадарчай тэрміналогіі» (1994) і інш.

**АРАШЭ́ННЕ**, ірыгацыя, падвядзенне вады на палі пры недахопе вільгаці, павелічэнне яе запасаў у глебе; адзін з відаў *меліярацыі*. Ажыццяўляецца праз *арашальныя сістэмы*. Аснову А. складаюць гідратэхн. прыёмы нармаванага паступлення вады ў глебу. Рэгулюе таксама т-ру паверхневага слоя глебы, прыземнага слоя паветра, станоўча ўздзейнічае на мікрабіял. працэсы ў глебе, рост і развіццё раслін, ураджай, пажыўныя якасці харч. культур. Дае магчымасць далучыць да с.-г. абароту дадатковыя плошчы, больш прадукцыйна выкарыстоўваць угоддзі. У зоне пустыняў і паўпустыняў земляробства існуе толькі на арашальных землях у аазісах. Амаль усе пасевы пад бавоўнікам і большасць пасеваў рысу размешчаны на арашоных землях. Адрозніваюць А. рэгулярнае (самацёчнае ці з мех. водападыманнем помпавымі станцыямі) і перыядычнае з падачай вады 1 раз у год ці толькі ў час моцнай засухі. Паводле спосабу падачы вады вылучаюць А. паверхневае (затапленнем глебы), дажджаванне, унутрыглебавае (з дапамогаю падземных трубаў), аэразольнае (паляпшае мікраклімат у прыземным слоі паветра).

А. вядома з часоў неаліту. Да пач. 19 ст. суветная плошча арашоных зямель складала 8 млн. га, да 20 ст. — 48 млн. га. У Расіі ў 1913 плошча А. каля 4 млн. га. Вял. плошчы (больш за 265 млн. га, 1990) арашоных зямель у Індыі, Пакістане, Кітаі, ЗША, Мексіцы, Іране, Японіі, Егіпце, Іраку, Узбекістане, Італіі, Балгарыі, Францыі і інш.

На Беларусі арашаюць пераважна пасевы шматгадовых траў, культурную пашу і ўчасткі пад агародніннымі культурамі; прадугледжваецца А. палёў у час засухі (пл. 67,8 тыс. га; 1994). Арашальныя сістэмы складаюць 6,3 тыс. км падземных трубаправодаў, каля 2,5 тыс. шт. дажджавальных машын і ўстановак, 545 электрыфікаваных помпавых стан-

цый, больш за 300 вадасховішчаў і сажалак. *Б.Я.Кухараў.*

**АРБА́** (цюрк.), павозка, 2-калёсная высокая ў Сярэдняй Азіі, 4-калёсная доўгая на Каўказе і Пд Украіны.

**АРБАВІ́РУСЫ**, група РНК-змяшчальных вірусаў пазваночных жывёл і чалавека, якія пераносяцца членістаногімі крывасмокамі (кляшчы, камары, маскіты, макрацы). Вядома больш за 300 А., з якіх патагенныя для чалавека каля 80. Выклікаюць арбавірусныя хваробы. На Беларусі вядомы зах. кляшчовы энцэфаліт, ліхаманка Зах. Ніла.

**АРБАЛЕ́Т** (франц. arbalète), старажытная ручная зброя ў выглядзе стальнога або драўлянага лука з драўляным ложам-прыкладам і механізмам для нацягвання цеціву. Пушчаныя з А. драўляныя стрэлы з жал. наканечнікамі ляцелі на адлегласць 300—400 крокаў і прабівалі рыцарскія латы. У краінах Еўропы вядомы з 11 ст. (ёсць звесткі, што ў Еўропу А. прынеслі крыжаносцы, якія запазычылі яго ў сарацынаў). На Русі наз. самастрэлам. На Беларусі выкарыстоўваўся ў 12—16 ст.

**АРБАЛІ́Т** (ад лац. arbor дрэва + *...lit*), лёгкі бетон, сумесь арган. запаўняльнікаў (драблёных адыходаў дрэваапрацоўкі, чароту, кастрыцы, канапель і інш.), вяжучага (звычайна партландцэменту) і вады. Сярэдняя (па аб'ёме) шчыльнасць 400—700 кг/м$^3$. З А. робяць сценавыя блокі, панэлі, пліты і да т. п. для малапавярховага будаўніцтва.

**АРБАРЫЦЫ́ДЫ** [ад лац. arbor дрэва + *...цыд*(ы)], хімічныя рэчывы, якія знішчаюць дрэвавую расліннасць і хмызнякі. А. з'яўляюцца эфіры і солі паліхлорзмяшчальных фенаксівоцатнай і амінапікалінавай кіслот. Выкарыстоўваюць А. для знішчэння дрэвавай расліннасці на пашах, сенажацях (апырскваюць парасткі, глебу, свежыя пні ці наносяць на кару дрэў), а таксама для хім. падсушвання дрэў на корані. Таксічныя для жывёл і чалавека рэчывы.

**АРБЕ́ЛІ** Іосіф Абгаравіч (20.3.1887, Кутаісі — 2.2.1961), сав. гісторык-усходазнавец. Акад. АН СССР (1935) і АН Арм. ССР (1943). Скончыў Пецярбургскі ун-т (1911). У 1914—31 дацэнт, праф. Пецярбургскага ун-та. З 1920 хавальнік фондаў, у 1934—51 дырэктар *Эрмітажа*. Першы прэзідэнт АН Арм. ССР (1943—47). Асн. даследаванні па каўказазнаўстве, гісторыі сярэдневяковай культуры Б. Усходу.

**АРБЕ́ЛІ** Лявон Абгаравіч (7.7.1882, Ерэван — 9.12.1958), савецкі фізіёлаг. Акад. АН СССР (1935, чл.-кар. 1932). Акад. АН Арм. ССР (1943). Акад. АМН СССР (1944). Ген.-палкоўнік мед. службы. Герой Сац. Працы (1945). Скончыў Ваенна-мед. акадэмію ў Пецярбургу (1904). Вучань і супрацоўнік І.П.*Паўлава*. Працаваў у н.-д. і вышэйшых навуч. установах Пецярбурга, Масквы. У 1936—50 дырэктар Ін-та фізіялогіі, з 1950 Ін-та эвалюц. фізіялогіі АН СССР. У 1942—46 віцэ-прэзідэнт АН СССР. Навук. працы па адаптацыйнатрафічнай ролі сімпатычнай нерв. сістэмы. Адзін са стваральнікаў сав. школы фізіёлагаў. Дзярж. прэмія СССР 1941. Прэмія імя І.П.Паўлава АН СССР (1937). Прысуджалася прэмія АН СССР яго імя.

*Тв.*: Избр. труды. Т. 1—5. М.; Л., 1961—68.
*Літ.*: Лейбсон Л.Г. Л.А.Орбели. Л., 1973.

**АРБЕЛЯ́Н** Канстанцін Агапаронавіч (н. 29.7.1928, г. Армавір Краснадарскага краю), армянскі кампазітар, дырыжор. Нар. арт. СССР (1979). Скончыў Ерэванскую кансерваторыю (1961). З 1956 маст. кіраўнік Дзярж. эстраднага аркестра Арменіі. Музыцы А. ўласцівыя яркая вобразнасць, экспрэсія, дынамічнасць, драматызм. Сярод твораў: балет «Бессмяротнасць» (1969), 2 сімфоніі (1961, 1967); сімф. паэма «Зангезур», «Святочная уверцюра» для сімф. аркестра; струнны квартэт; творы для эстр.-сімф. аркестра; музыка да драм. спектакляў і кінафільмаў. У песнях А. нац. мелас арганічна спалучаецца са сродкамі джаза.

Да арт. Арашэнне. Будаўніцтва канала ў пустыні.



Арбалет з запальнай стралой.

**А́РБЕНС ГУСМА́Н** (Arbenz Guzmán) Хакоба (14.9.1913—27.1.1971), дзярж. і паліт. дзеяч Гватэмалы. У 1945—50 міністр абароны, у 1951—54 прэзідэнт. Урад А.Г. праводзіў палітыку абароны нац. інтарэсаў краіны, ажыццявіў шэраг прагрэс. сац.-эканам. рэформаў. Скінуты ў выніку ўзбр. інтэрвенцыі ЗША. У 1957 эмігрыраваў.

**А́РБЕР** (Arber) Агнес (1879—22.3.1960), англійскі батанік. Чл. Каралеўскага т-ва (з 1946). Скончыла Лонданскі і Кембрыджскі ун-ты. Навук. працы па гісторыі батанікі 15—17 ст., палеабатаніцы голанасенных і марфалогіі пакрытанасенных. Распрацавала тэорыю філома, паводле якой асн. органам вышэйшых раслін з'яўляецца парастак.

*Тв.*: Water plants. Cambrige, 1920; Monocotyledons. Cambrige, 1925; The Gramineae. Cambrige, 1934; Herbals. Cambrige, 1938; The natural philosophy of plant form. Cambrige, 1950.

**А́РБЕР** (Arber) Вернер (н. 3.6.1929, г. Грэнхен, Швейцарыя), швейцарскі генетык. Скончыў політэхн. школу ў Цюрыху. З 1953 у Жэнеўскім ун-це. Праф. Базельскага ун-та. Навук. працы па вывучэнні структуры і функцыянавання віруснага геному. Сфармуляваў прынцып штамаспецыфічнай рэстрыкцыі і мадыфікацыі ДНК. Адкрыў (1962) новы клас ферментаў, якія спецыфічна ўзаемадзейнічаюць з ДНК і дзеянне якіх накіравана супраць чужароднай ДНК. Нобелеўская прэмія па фізіялогіі і медыцыне 1978 (разам з Д.Натансам і Г.Смітам).

*Літ.*: Лауреаты Нобелевской премии 1978 г. // Природа. 1979. № 1.

**АРБІ́НІ** (Orbini) Маўра (?—1614), далматынскі гісторык, родапачынальнік паўднёваслав. гіст. навукі. У кн. «Славянскае царства» (1601, на італьян. мове) спрабаваў даць гісторыю ўсіх слав. народаў, паказаць іх адзінства; прапанаваў тэорыю скандынаўскага паходжання славян, памылкова далучаў да славян многія неслав. народы. У сваім творы змясціў пераклад сербскай хронікі 12 ст.

**АРБІ́ТА** ў астраноміі, траекторыя руху нябеснага цела ў касм. прасторы. У найпрасцейшым выпадку прыцягненне двух целаў, адно з іх рухаецца адносна другога паводле *Кеплера законаў* па кеплеравай (няўзбуранай) А., што мае форму эліпса, у фокусе якога знаходзіцца цэнтр. цела S.

А. цела ляжыць у нязменнай плоскасці, што праходзіць праз пачатак каардынат (цела S). Лінія SN перасячэння плоскасці А. з асн. каардынатнай плоскасцю (плоскасцю *эклі-*

*птыкі*) наз. ліній вузлоў. Няўзбураную А. вызначаюць элементы: *i* — нахіл А. да плоскасці эклімтыкі і Ω — даўгата ўзыходнага вузла (становішча А. ў прасторы); *a* — вял. паўвось і *e* — эксцэнтрысітэт (памеры і форма А.); w — вуглавая адлегласць *перыцэнтра П* ад узыходнага вузла (становішча А. ў яе плоскасці); *T* — момант праходжання цела праз перыцэнтр. Адхіленні рэальнай А. ад кеплеравай наз. ўзбурэннямі (гл. *Узбурэнні нябесных целаў*). Для вызначэння элементаў узбурэнняў А. неабходны сістэматычныя назіранні (астраметрыя, радыёлакацыя, аптычная лакацыя).

**«АРБІТА»**, сістэма спадарожнікавай сувязі і яе наземных радыёстанцый, створаная ў былым СССР. Эксплуатуецца з 1965 на базе ШСЗ *«Маланка»*, з 1980-х г. выкарыстоўваюцца таксама ШСЗ *«Вясёлка»* і *«Гарызонт»*; мае прыёмна-перадавальныя і прыёмныя радыёстанцыі. Ажыццяўляе рэтрансляцыю праграм тэлебачання, тэлеф., тэлеграф. і фотатэлеграф. сувязь.

Тыповая прыёмная станцыя мае антэну з парабалічным адбівальнікам дыяметрам 12 м, якая пры дапамозе паваротнай сістэмы суправаджае спадарожнік сувязі з высокай дакладнасцю (да некалькіх вуглавых мінут). Радыёсігналы выпрамяняюцца перадавальнай станцыяй у напрамку спадарожніка, прымаюцца ім, узмацняюцца і перадаюцца на Зямлю. Прынятыя і ўзмоцненыя (да 10 млн. разоў) прыёмнай станцыяй сігналы перадаюцца ў эфір. Працягласць сеансаў радыёсувязі праз адзін ШСЗ «Маланка» 6—10 гадз за суткі. Пры выкарыстанні 3 і болей ШСЗ, рух якіх сінхранізаваны, дасягаецца кругласутачная радыёсувязь.

**АРБІТА́ЛЬНАЯ СТА́НЦЫЯ**, касмічны апарат, які працягліы час функцыянуе на арбіце штучнага спадарожніка Зямлі або інш. планеты ці яе спадарожніка. Можа дзейнічаць у пілатуемым (з экіпажам касманаўтаў) і аўтам. рэжымах. Першая ў свеце эксперым. А.с. створана 16.1.1969 на арбіце стыкоўкай караблёў «Саюз-4» і «Саюз-5»; доўгачасовая сав. А.с. *«Салют»* выведзена на арбіту 19.4.1971; у ЗША А.с. *«Скайлэб»* запушчана 14.5.1973; з 20.2.1986 дзейнічае А.с. *«Мір»*.

А.с. дастаўляецца на арбіту 2 спосабамі: цалкам збіраецца на Зямлі і выводзіцца на арбіту *ракетай-носьбітам* (маса і габарыты А.с. абмежаваны энергет. магчымасцямі ракеты); зборка ажыццяўляецца на арбіце з элементаў, якія дастаўляюцца ракетамі-носьбітамі ці *транспартнымі караблямі*, што дае магчымасць ствараць А.с. неабходнай масы, аб'ёму і канфігурацыі, у працэсе эксплуатацыі мяняць яе прызначэнне і спецыялізацыю. Найб. важная праблема пры стварэнні А.с. — *стыкоўка* на арбіце. Канструкцыі А.с. прадугледжваюць вырашэнне праблем пераадольвання працяглага ўздзеяння бязважкасці на арганізм чалавека, аховы ад радыяцыі і мікраметэарытаў, забеспячэння надзейнасці і дастатковага рэсурсу працы бартавых сістэм і інш.




Эліптычная арбіта планеты *P* у прасторы: *S* — Сонца; *П* — перыгелій; *N* — узыходны вузел. Вось *SX* накіравана ў пункт веснавога раўнадзенства.

Прыёмная тэлевізійная станцыя сістэмы «Арбіта».

Арбітальная станцыя «Скайлэб» у палёце.

А.с. выкарыстоўваюцца для даследавання каляземнай (каляпланетнай) касм. прасторы і Зямлі (планеты) з арбіты штучнага спадарожніка; правядзення метэаралагічных і астр. назіранняў, медыка-біял. і тэхн. эксперыментаў, ваеннай разведкі і інш., могуць служыць базай для зборкі і запуску цяжкіх міжпланетных касм. караблёў.

**АРБІТА́ЛЬНЫ МО́МАНТ**, момант імпульсу мікрачасціцы пры яе руху ў сілавым сферычна сіметрычным полі. Паводле *квантавай механікі* А.м. квантаваны: яго модуль L і праекцыя $L_z$ на адвольную вось маюць дыскрэтныя значэнні — $L^2 = \hbar^2 l(l+1)$, $L_z = m\hbar$, дзе $\hbar = h/(2\Pi)$, h — *Планка пастаянная*, l = 0,1,2, ... — арбітальны квантавы лік, m = l, l - 1, ..., -l — магнітны квантавы лік. Класіфікацыя станаў мікрачасціц па значэнні l адыгрывае важную ролю ў тэорыі атама і атамнага ядра, у тэорыі сутыкненняў.

**АРБІ́ТР** (лац. arbiter), 1) пасрэднік, член трацейскага суда, *арбітража*. 2) Спартыўны суддзя, які сочыць за выкананнем правілаў гульняў, спаборніцтваў, ацэньвае іх вынікі і прымае рашэнні ў спрэчных выпадках.

**АРБІТРА́Ж** (франц. arbitrage), спосаб разгляду спрэчных спраў, пры якім зацікаўленыя бакі звяртаюцца да арбітраў (гл. *Трацейскі суд*). У б. СССР існаваў у 1931—91. Вырашаў спрэчкі паміж дзярж., кааператыўнымі і грамадскімі арг-цыямі. На Беларусі функцыі А. перайшлі да створаных у 1991 *гаспадарчых судоў*. Спрэчкі паміж дзяржавамі вырашае *арбітраж міжнародны*.

**АРБІТРА́Ж МІЖНАРО́ДНЫ**, міжнародны орган па мірным вырашэнні спрэчак паміж дзяржавамі. Прадугледжаны многімі міжнародна-прававымі актамі, у т.л. Статутам ААН. Парадак фарміравання А.м. і яго працэдура рэгулююцца Гаагскай канвенцыяй аб мірным вырашэнні міжнар. сутыкненняў 1907 і Узорнымі правіламі арбітражнага працэсу 1958. Ствараецца для разгляду адной або некалькіх спраў ці на пастаяннай аснове. Арбітраў выбіраюць самі дзяржавы — удзельніцы спрэчкі ў складзе 1 прадстаўніка ад кожнай з іх і прадстаўнікоў ад трэціх дзяржаў. Пастаянны міжнар. арбітражны орган — Пастаянная палата трацейскага суда, заснаваная ў Гаазе ў 1899. Бакамі ў арбітражным працэсе звычайна выступаюць дзяржавы, але могуць быць міжнар. арг-цыі або прыватныя фірмы, карпарацыі.

**АРБУ́ЗАЎ** Аляксандр Ермінінгельдавіч (11.9.1877, с. Арбузава-Баран Казанскай губ. — 21.1.1968), савецкі хімік-арганік. Акад. АН СССР (1942, чл.-кар. 1932). Герой Сац. Працы (1957). Скончыў Казанскі ун-т (1900). У 1911—30 праф. гэтага ун-та, у 1930—63 — Казанскага хім.-тэхнал. ін-та. У 1946—65 старшыня прэзідыума Казанскага філіяла АН

СССР. Заснавальнік хіміі фосфараарган. злучэнняў, універсальнага метаду сінтэзу гэтых злучэнняў (перагрупоўка А.); адкрыў фізіял. актыўнасць фосфаразмяшчальных злучэнняў (сярод іх лекавыя сродкі і інсектыцыды), рэакцыі ўтварэння свабодных радыкалаў трыарылметылавага шэрагу, вынайшаў эталонны радыкал дывінілпікрылгідразіл. Вывучаў прыродныя крыніцы арган. злучэнняў, распрацаваў новы метад падсочкі хваёвых дрэў, тэорыю выцякання жывіцы і тэхніку яе збору, прапанаваў шэраг лабараторных прылад. Аўтар работ па гісторыі хіміі.

*Літ.*: Академик А.Е. Арбузов: [Сб. воспоминаний]. 2 изд. Казань, 1985.

**АРБУ́ЗАЎ** Аляксей Мікалаевіч (26.5.1908, Масква — 20.4.1986), рускі драматург. Скончыў тэатр. школу ў Ленінградзе. Працаваў у тэатрах Ленінграда і Масквы. Аўтар п'ес «Далёкая дарога» (1935), «Таня» (1938), «Горад на світанні» (1941), «Іркуцкая гісторыя» (1959), «Казкі старога Арбата» (1970), «Старамодная камедыя» (1975), «Пераможніца» (1983) і інш. У творах тонка спалучае псіхалагізм з лірызмам, жыццёвую дакладнасць з рамантычнай узнёсласцю, вастрыню сюжэтных калізій з вольнай кампазіцыяй п'есы. Дзярж. прэмія СССР 1980.

**АРВА́Д**, стараж. горад-дзяржава ў Паўн. Фінікіі. Упершыню ўпамінаецца ў егіп. крыніцах пач. 15 ст. да н.э. З 8 ст. да н. э. пад уладай Асірыі. На пач. 7 ст. да н. э. — Вавілоніі. Пры Ахеменідах меў аўтаномію. У 332 да н. э. перайшоў на бок Аляксандра Македонскага. З 5 ст. да н.э. ў А. чаканілі манету.

**АРГА́ЗМ** (ад грэч. orgaō гарэць страсцю), вышэйшая ступень сладастраснага пачуцця, якое ўзнікае ў момант завяршэння палавога акта або пры іншых формах палавой разрадкі (*мастурбацыі, петынгу*, эратычным фантазіраванні і да т.п.).

У аснове А. ляжыць безумоўны рэфлекс, які падмацоўвае сукупнасць сексуальных рэакцый, фарміруючы цэласны акт паводзін; у гэтым — біял. роля А. У самак большасці відаў жывёл (акрамя некаторых млекакормячых) А. адсутнічае і не з'яўляецца абавязковым для апладнення. У сексалогіі А. разумеюць як вынік складанага ўзаемадзеяння шэрагу структурна-функцыянальных сістэм на розных узроўнях.

Жаночы А. (адрозніваюць клітарыяльны і клітарыяльна-вагінальны) больш разнастайны і працяглы ў параўнанні з мужчынскім, у пэўнай меры звязаны са стымуляцыяй эрагенных зон і характарам сексуальнай гульні. У адрозненне ад здаровых мужчын, у якіх заканчэнне палавога акта ў норме звычайна завяршаецца наступленнем А., у многіх здаровых жанчын поўнае абуджэнне сексуальнасці настае праз некалькі месяцаў або гадоў пасля пачатку рэгулярнага палавога жыцця. У далейшым А. бывае не пры кожным палавым акце; значная частка жанчын пакутуе на *анаргазмію*, якая паддаецца карэкцыі, некаторыя — на *фрыгіднасць*. Вонкавыя праяўленні А. ў абодвух палоў абумоўліваюцца тыпам палавой канстытуцыі, тэмпераменту, агульным і палавым выхаваннем.

**АРГАЛІ́**, млекакормячая жывёла, гл. *Архар*.

**АРГА́Н** (ад грэч. organon прылада, інструмент), клавішна-духавы муз. інструмент.

Складаецца з мноства трубаў (металічных і драўляных, лабіяльных і язычковых, адкрытых і закрытых) розных памераў і формаў, кожная з якіх дае гук пэўнай вышыні і тэмбру, паветранагнятальнага механізма (мяхі, паветраправоды), апарата кіравання — кафедры, дзе размешчаны клавіятуры для рук (2—7 мануалаў) і ног (1—2 педалі), дапаможныя прыстасаванні (кнопкі, рычагі, рэгістравыя ручкі); сістэма перадачы (трактура) — электрамеханічная (пры ёй кафедра можа перамяшчацца на эстрадзе). Групы трубаў аднаго тэмбру, але рознай вышыні гучання ўтвараюць рэгістры. З-за вял. памераў, шырокага гукавога дыяпазону, багацця тэмбраў і іх спалучэнняў А. наз. «каралём інструментаў».

Арган у зале Беларускай філармоніі.

Арган Праабражэнскага касцёла ў в. Новая Мыш Баранавіцкага раёна Брэсцкай вобл. 1762.

Вадзяны А. (гідраўлас) вядомы з 3 ст. да н. э. З 4 ст. ў Візантыі выкарыстоўваўся як свецкі інструмент, з 8 ст. паявіўся ў Зах. Еўропе, дзе ўведзены ў каталіцкія храмы. Росквіт арганнага мастацтва (16—18 ст.) звязаны з развіццём арганабудаўніцтва (сярод вядомых майстроў А. Шнітгер, сем'і Каспарыні, Зільберманаў), узнікненнем арганных школ у Італіі, Францыі, Іспаніі, Нідэрландах, Германіі, дзейнасцю кампазітараў і выканаўцаў (А. і Дж.Габрыелі, Дж.Фрэскабальдзі, Ф.Куперэн, І.Пахельбель, І.С.Бах). У 19—20 ст. для А. пісалі Ф.Ліст, М.Рэгер, П.Хіндэміт, А.Месіян, у Расіі С.Танееў, Ф. і А.Гедыке, Р.Шчадрын і інш. На Беларусі паяўленне А., дакументальна засведчанае ў пач. 16 ст., абумоўлена распаўсюджаннем каталіцкага веравызнання, буд-вам касцёлаў, правядзеннем службаў. Захаваліся А., багата дэкарыраваныя ў барочным і класіцыстычным стылях у касцёлах езуітаў і францысканцаў у Гродне, у в. Новая Мыш Баранавіцкага р-на. Мясц. музыканты атрымлівалі адукацыю ў Варшаве, Вільні, Мінску (у 1871—97 існавала *Мінскае вучылішча арганістаў*). У 2-й пал. 20 ст. А. і выканальніцтва на ім сталі прыкметнай з'явай свецкай муз. культуры рэспублікі. А. ўстаноўлены ў Бел. філармоніі (1963), у зале камернай музыкі Бел. філармоніі ў Троіцкім Залатагорскім касцёле (1983), у Полацкім Сафійскім саборы (1985). Сярод бел. арганістаў А.Янчанка, К.Шараў. Музыку для А. пішуць бел. кампазітары А.Залётнеў, А.Навахрост, Л.Шлег і інш.

*І.Дз.Назіна.*

**АРГА́Н** (ваен.), шматствольная артыл. гармата 16—18 ст. ў Еўропе, у т.л. на Беларусі; прататып шматствольнай артылерыі. Меў ад 6 да 50 і больш ствалоў (ружжаў, марцірак, малакаліберных пушак), якія замацоўваліся ў некалькі радоў на асобным вале або рамах, звычайна на калёсным лафеце. Страляў адначасова з усіх ствалоў аднаго раду. Выраблялі А. ў многіх гарадах Беларусі: Быхаве, Нясвіжы, Полацку, Слуцку і інш. У Расіі такія гарматы наз. *сарокамі*.

**АРГАНАГЕНЕ́З** (ад грэч. organon прылада, інструмент + *...генез*), утварэнне зачаткаў органаў і іх дыферэнцыроўка ў анта- або філагенез шматклетачных арганізмаў. Амаль ва ўсіх жывёл зародак мае 3 зародкавыя лісткі: эктадэрму, мезадэрму і энтадэрму. У пазваночных з эктадэрмы ўзнікаюць зачаткі ц.н.с., органаў пачуццяў, покрываў, з мезадэрмы — шкілета, мускулатуры, крывяноснай сістэмы, палавых органаў і органаў выдзялення, з эктадэрмы — кішачная трубка, з якой потым утвараюцца зачаткі печані, падстраўнікавай залозы, органаў дыхання. Антагенетычны А. да пэўнай ступені ўзнаўляе філагенетычны. У раслін А. — гэта фарміраванне і развіццё асн. органаў (кораня, сцябла, ліста, кветак) у працэсе *антагенезу* з мерыстэмы.

**АРГАНАГЕ́ННЫЯ ГО́РНЫЯ ПАРО́ДЫ**, біягенныя пароды, біяліты, асадкавыя горныя пароды, складзеныя з рэшткаў жывёльных і раслінных арганізмаў або прадуктаў іх жыццядзейнасці. Паводле рэчыўнага саставу падзяляюцца на карбанатныя (вапнякі), крамяністыя (дыятаміт, радыялярыт і інш.), фасфатныя (ракушачнік, касцяныя брэкчыі, гуана), вугляродзістыя (выкапнёвыя вугалі, гаручыя сланцы, нафты, цвёрдыя бітумы) пароды (гл. таксама *Арганагенныя пабудовы*). На тэр. Беларусі да А.г.п. належаць нафта, бурыя вугалі, гаручыя сланцы, торф, мелавыя пароды і інш.

*Літ.*: Логвиненко Н.В. Петрография осадочных пород с основами методики исследования. 3 изд. М., 1984; Неотектоника и полезные ископаемые Белорусского Полесья. Мн., 1984.

**АРГАНАГЕ́ННЫЯ ПАБУДО́ВЫ**, адасобленыя масіўныя карбанатныя целы, утвораныя з рэшткаў шкілетаў марскіх арганізмаў і карбанатных адкладаў. Вылучаюць А.п. простыя (*біястромы, біягермы*) і складаныя (біястромныя, біягермавыя і рыфавыя масівы). Узніклі на месцах пражывання каланіяльных і адзінкавых рыфастваральных арганізмаў. Іх рэшткі мацаваліся карбанатам кальцыю і ўтваралі каркас, у якім назапашваліся карбанатныя асадкі з рэшткаў рыфалюбаў. У адкладах Беларусі трапляюцца пераважна простыя А.п. з рэшткаў водарасцяў, каралаў, страматапораў, імшанак, радзей чарвей. Вядомы ў адкладах Аршанскай упадзіны (верхні пратэразой, сярэдні дэвон), паўн. раёнаў Беларусі (ардовік), Брэсцкай упадзіны (сілур, ніжні дэвон), Прыпяцкага прагіну (верхні дэвон, карбон). Да верхнедэвонскіх А.п. Прыпяцкага прагіну прымеркаваны радовішчы нафты і газу.

**АРГАНАГЕ́НЫ**, хім. элементы, неабходныя для жыццядзейнасці жывых арганізмаў. Вядома каля 20 элементаў. Сав. вучоны Б.Б.Палынаў (1968) вылучыў А. абсалютныя (*кісларод, вадарод, вуглярод, азот, марганец, калій, сера*), без якіх немагчыма існаванне арганізмаў і з якіх пераважна пабудаваны арган. рэчывы — *бялкі, тлушчы, вугляводы, ферменты, гармоны, вітаміны* і прадукты іх пераўтварэнняў, і А. спецыяльныя (*крэмній, натрый, кальцый, жалеза, фтор, магній, стронцый, бор, цынк, медзь, бром, ёд*), неабходныя многім, але не ўсім арганізмам.

**АРГАНАЛО́ГІЯ**, навуковая дысцыпліна, якая вывучае муз. інструменты — іх канструкцыю, форму, матэрыял, спосабы вырабу і рэканструкцыі, акустычна-тэмбравыя якасці, выканальніцкія магчымасці, грамадскае і маст. выкарыстанне, адлюстраванне ў літ. і выяўл. помніках. Тэрмін «А.» прапанаваны Н. Бесарабавым у 1941 для вылучэння навук. і тэхн. аспектаў даследавання муз. інструментаў з больш шырокага вывучэння музыкі. Сучасная А. (паводле славацкага даследчыка О.Эльшака) уключае субдысцыпліны: сістэматычную (тэарэтычную) А., тэхнічную А. (эргалогію і тэхналогію), арганаакустыку, арганасацыялогію і гісторыю інструментаў, палеаарганалогію (ацэнка археал. адкрыццяў і інш. доказаў існавання старадаўніх інструментаў), арганаіканаграфію (выяўл. крыніцы) і этнаарганалогію (вывучэнне традыц. муз. інструментаў розных народаў). З пач. 20 ст. ў А. выяўляецца тэндэнцыя да інтэграцыі і адзінства сістэматычнага, гіст. і

Да арт. **Арганаўты.** Геракл і арганаўты. Размалёўка кратэра з г. Арвіета. Каля 450 да н.э.

антрапалагічнага аспектаў, пераважна ў працах К.Закса (Германія; 1910—30-я г.) і Э.М. фон Хорнбастэля (Аўстрыя), якія распрацавалі сучасную класіфікацыю муз. інструментаў. Развіццю А. садзейнічаюць міжнар. інструментазнаўчыя арганізацыі, спецыялізаваныя музеі (Брусель, Стакгольм, Парыж), арганалагічныя школы (у Германіі, Швецыі), даследаванні і публікацыі арганолагаў (Эльшак, Ю.Страйнар, І.Мачак, Я.Станшэўскі, І.Мацыеўскі). На Беларусі распрацоўкай праблем этнаарганалогіі ў кантэксце нар. культуры і сувязі муз. інструмента і музыкі займаецца І.Назіна.

*Літ.*: Назина И.Д. Белорусские народные музыкальные инструменты: Самозвучащие, ударные, духовые. Мн., 1979; Яе ж. Белорусские народные музыкальные инструменты: Струнные. Мн., 1982; Bessaraboff N. Ancient European musical instruments. Boston. 1941; Nettl B. Theory and method in ethnomusicology. New York, 1964; Elschek O. Instrumenty muzyczne jako przedmiot badań historycznych i antropologicznych (przyczynek do koncepcji instrumentologii) // Muzyka. 1974. № 1. *І.Дз.Назіна.*

**АРГА́НА-МІНЕРА́ЛЬНЫЯ ЎГНАЕ́ННІ**, гумінавыя ўгнаенні, угнаенні з арган. рэчываў і звязаных з імі хімічна ці адсарбцыйна мінер. злучэнняў. Атрымліваюць апрацоўкай *гумінавых кіслот* ці матэрыялаў, у якіх яны ёсць (торф, буры вугаль, сланец, глей, перагной), аміякам, аміячнай вадой, аміячнымі растворамі фасфатаў, фосфарнай к-той, калійнымі солямі. Маюць розны састаў і назву: гумафос, гумафоска, торфа-аміячныя ўгнаенні, гуматы натрыю, амонію і інш. Найб. пашыраны торфа-мінеральныя і торфа-аміячна-мінер. ўгнаенні.

**АРГАНАТЭРАПІ́Я**, лячэнне прэпаратамі, атрыманымі з залоз унутранай сакрэцыі або інш. органаў і тканак жывёл. Часцей мае замяшчальны характар — уводзяцца рэчывы, якіх не хапае ў арганізме хворага і якія выпрацоўваюцца або назапашваюцца ў адпаведных органах. Да А. належыць і перасадка органаў (касцявы мозг, ныркі, печань, сэрца), калі яны не выконваюць сваіх функцый (гл. *Трансплантацыя*). Да арганапрэпаратаў адносяцца прэпараты гіпофіза (пітуітрын, пралактын, АКТГ), шчытападобнай залозы (тырэаідзін), парашчытападобных залозаў (паратгармон), падстраўнікавай залозы (інсулін, ліпакаін), кары паднырачнікаў (картызон), вілачкавай залозы (тымазін), жаночых (фалікулін, сінестрол, прагестэрон) і мужчынскіх (метыландрастэндыёл) палавых органаў. Прэпараты ўводзяцца ўнутрымышачна або ўнутрывенна. Выцяжка з селязёнкі (спленін) стымулюе імунітэт. Пры нізкай страўнікавай сакрэцыі ў хворых на гастрыт, пры язвавай хваробе як замяшчальны выкарыстоўваюць страўнікавы сок сабак, свіней (натуральны сок, сугаст). У гематалагічнай практыцы выкарыстоўваецца натуральная кроў, плазма крыві, суспензія эрытрацытаў, трамбацытаў. Яны выконваюць замяшчальную функцыю і стымулююць імунітэт. *Л.Р.Кажарская.*

**АРГАНА́ЎТЫ**, у грэчаскай міфалогіі героі паходу па залатое руно, якое ахоўваў дракон. Больш за 50 А. пад кіраўніцтвам *Ясона* накіраваліся на караблі «Арго» ў Калхіду. З дапамогай чараўніцы *Медэі* захапілі руно і прывезлі яго ў Грэцыю. Паход А. — часты сюжэт у творах ант. і пасляант. мастацтва (рэльеф у Дэльфах, кратэр сярэдзіны 5 ст. да н.э.); ён выкарыстаны ў эпасах Апалонія Радоскага і В.Флака, драм. трылогіі Ф.Грыльпарцэра, оперы Л.Керубіні і інш.

**АРГАНЕ́ЛЫ**, спецыялізаваныя структуры цытаплазмы аднаклетачнай жывёлы, аналагічныя аднаму з органаў шматклетачнай, што выконваюць пэўныя функцыі: рухальныя, скарачальныя, рэцэпторныя, стрававальныя, сакраторныя і экстраторныя, нападу і абароны.

**АРГАНІЗАВА́НАЯ ЗЛАЧЫ́ННАСЦЬ**, форма злачыннай дзейнасці аб'яднанняў злачынцаў. Вызначаецца высокай самаарганізацыяй, прафесіяналізмам, іерархічнай сістэмай узаемаадносін, манапалізацыяй розных сфераў злачыннай дзейнасці з мэтай здабычы максімальных даходаў і выкарыстання легальных шляхоў для «адмывання» злачынна здабытых сродкаў, нейтралізацыяй і карумпіраваннем дзярж. органаў, пашырэннем злачынных сувязяў за межы краіны. Гл. таксама *Мафія, Рэкет.*

**АРГАНІЗАВА́НЫ НАБО́Р РАБО́ЧЫХ**, планавае міжгаліновае і тэрытарыяль-

нае пераразмеркаванне працоўных рэсурсаў у б. СССР і інш. краінах сацыяліст. арыентацыі для забеспячэння патрэб нар. гаспадаркі ў рабочай сіле і для працаўладкавання грамадзян. Ажыццяўляўся спец. дзярж. органам. Рабочыя арганізаванага набору мелі льготы, накіроўваліся пераважна на новабудоўлі. З Беларусі да 1941 па А.н.р. накіравана 1 млн. 629 тыс. чал. (пераважна сельскага насельніцтва) на лесанарыхтоўкі, у рыбную прам-сць, у Данбас, на будоўлі Масквы, Ленінграда і інш. За 1944—76 А.н.р. склаў 588,4 тыс. чал., найб. інтэнсіўны ён быў у 1950—53. У 1956—66 з БССР на асваенне цалінных зямель накіравана больш за 48 тыс. сем'яў (каля 179 тыс. чал.). У 1961—71 штогодні набор зменшыўся больш як у 5 разоў. З фарміраваннем рыначнай эканомікі забеспячэнне нар. гаспадаркі рабочай сілай адбываецца праз рынак працы.

Да арт. Арганізацыя Аб'яднаных Нацый. Кіраўнік дэлегацыі БССР К.В.Кісялёў падпісвае Статут ААН. Сан-Францыска. 26.6.1945.

**АРГАНІЗАЦЫЙНАЯ СТРУКТУ́РА** ў эканоміцы, сукупнасць устойлівых і лагічных суадносін узроўняў кіравання і функцыянальных сфераў суб'екта гаспадарання, прызначаных забяспечыць эфектыўнае дасягненне мэты. Аптымальная А.с. — найважнейшая ўмова *арганізацыі вытворчасці*.

**АРГАНІЗАЦЫЙНАЯ ТЭ́ХНІКА**, гл. *Аргтэхніка*.

**АРГАНІЗА́ЦЫЯ** (франц. organisation ад позналац. organizo надаю зграбны выгляд, упарадкоўваю), 1) ступень і характар упарадкаванасці элементаў сістэмы, яе адэкватнасць *функцыям*, што выконвае гэта сістэма. Паняцце «А.» азначае сістэмны аб'ект, упарадкаванасць, мэтанакіраваную дзейнасць кібернетычных сістэм, сац. сістэму як сродак дасягнення мэты. Сама канцэпцыя А., такім чынам, уключае агульнафіласофскі, сістэмны, кібернетычны і сацыялагічны падыходы. Стварыць агульнае вучэнне аб А. спрабаваў А.А.Багданаў (1913), які выказаў ідэю ізамарфізму розных арганізацыйных структур, блізкую да *агульнай тэорыі сістэмы*, кібернетыкі, сінергетыкі, канцэпцыі глабальнага эвалюцыянізму і інш. Вызначальныя рысы А. — упарадкаванасць, функцыянальнасць, іерархічнасць. Упарадкаванасць уключае парадак (разнастайнасць устойлівых сувязяў у патоку змен), кампазіцыю элементаў (від упарадкаванасці) і функцыянальную залежнасць (змена элемента вядзе да змены інш. элементаў ці ўсёй сістэмы ў цэлым і, наадварот, змена сістэмы вядзе да змены яе структурных элементаў). Функцыянальнасць характарызуе адносіны сістэмы з навакольным асяроддзем, дасягненне за кошт А. прыстасавальнага (функцыянальнага) эфекту. Сутнасць іерархічнасці ў тым, што кожная А. мае розныя ўзроўні (сістэмы і падсістэмы, ступені, формы, структуры, тыпы і г.д.), разуменне якіх спрыяе выяўленню генетычнай сувязі паміж імі: у нежывой прыродзе — ад субклетачнага да Метагалактыкі, у жывой прыродзе — ад субклетачнага да біясфернага (і ноасфернага), у грамадстве — ад чалавека да соцыума. 2) Аб'яднанне людзей для сумеснай рэалізацыі пэўнай праграмы ці мэты на аснове вызначаных правілаў дзеяння. 3) Сукупнасць працэсаў ці дзеянняў, якія вядуць да ўтварэння і ўдасканальвання ўзаемасувязяў паміж часткамі цэлага.

*Літ.*: Богданов А.А. Текстология: Всеобщая организационная наука. Кн. 1—2. М., 1989; Пригожин И., Стенгерс И. Порядок из хаоса: Пер. с англ. М., 1986.

*Г.І.Шчарбіцкі.*

**АРГАНІЗА́ЦЫЯ АБ'ЯДНА́НЫХ НА́ЦЫЙ** (United Nations; ААН), міжнародная арганізацыя, створаная для падтрымання міру, бяспекі і развіцця супрацоўніцтва паміж усімі краінамі.

Арганізац. і структурныя асновы ААН закладваліся ў час 2-й сусв. вайны вядучымі дзяржавамі *антыгітлераўскай кааліцыі*. 1.1.1942 у Вашынгтоне 26 краін падпісалі Дэкларацыю Аб'яднаных Нацый (назву «Аб'яднаныя Нацыі» прапанаваў прэзідэнт ЗША Ф.Рузвельт). У Дэкларацыі, прынятай



Будынак Сакратарыята Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у Нью-Йорку.

30.10.1943 на Маскоўскай нарадзе міністраў замежных спраў, ад імя ўрадаў заяўлена пра неабходнасць «заснавання ў найкарацейшы тэрмін агульнай міжнароднай арганізацыі для падтрымання міру і бяспекі, заснаванай на прынцыпе суверэннай роўнасці ўсіх міралюбівых дзяржаў». На *Думбартан-Окс канферэнцыі 1944* прадстаўнікі Вялікабрытаніі, ЗША, Кітая і СССР распрацавалі прапановы па статуце такой арг-цыі. На *Крымскай канферэнцыі 1945* кіраўнікі Вялікабрытаніі, ЗША і СССР дамовіліся на ўстаноўчую канферэнцыю ў Сан-Францыска ў якасці першапачатковых дзяржаў — заснавальніц ААН запрасіць Беларускую ССР і Украінскую ССР, ацэньваючы ўклад народаў гэтых рэспублік у перамогу над фашызмам. *Сан-Францыская канферэнцыя 1945* прыняла Статут ААН. Урачыстае яго падпісанне адбылося 26.6.1945 прадстаўнікамі 50 дзяржаў, у т.л. і БССР. Гэтыя краіны, а таксама не прадстаўленая на канферэнцыі Польшча (падпісала Статут некалькі пазней), сталі першапачатковымі дзяржавамі — членамі ААН. Афіц. датай утварэння ААН лічыцца 24.10.1945, калі яе Статут набыў сілу пасля здачы ратыфікацыйных грамат Вялікабрытаніяй, ЗША, Кітаем, СССР, Францыяй і большасцю інш. краін, якія яго падпісалі (БССР ратыфікавала Статут 30.8.1945). 24 кастр. адзначаецца штогод як Дзень ААН.

Паводле Статута мэты ААН: падтрымліваць міжнар. мір і бяспеку, выкарыстоўваючы эфектыўныя калект. захады супраць агрэсіі ці інш. парушэнняў міру; праводзіць мірнымі сродкамі адпаведна з прынцыпамі справядлівасці і міжнар. права ўрэгуляванне або вырашэнне міжнар. спрэчак ці сітуацый, што могуць прывесці да парушэння міру; развіваць дружалюбныя адносіны паміж нацыямі на аснове павагі прынцыпу раўнапраўя і самавызначэння народаў і рабіць адпаведныя захады на ўмацаванне ўсеагульнага міру; ажыццяўляць міжнар. супрацоўніцтва ў вырашэнні праблем эканам., сац., культ характару, заахвочваць і ўмацоўваць павагу да правоў чалавека і асн. свабод для ўсіх, незалежна ад расы, полу, мовы і рэлігіі. У сваёй дзейнасці ААН кіруецца прынцыпамі суверэннай роўнасці ўсіх яе членаў, добрасумленнага выканання імі прынятых на сябе ў адпаведнасці са Статутам абавязацельстваў, вырашэння міжнар. спрэчак мірнымі сродкамі, неўмяшання ў справы, якія па сутнасці ўваходзяць ва ўнутр. кампетэнцыю любой дзяржавы. ААН забяспечвае ў адпаведнасці з яе прынцыпамі дзейнасць дзяржаў, якія не з'яўляюцца членамі арг-цыі. Паводле Статута прыём у члены ААН адкрыты для ўсіх міралюбівых дзяржаў, якія бяруць на сябе абавязкі, абумоўленыя Статутам, могуць і жадаюць іх выконваць. Прыём праводзіцца *Генеральнай Асамблеяй ААН* па рэкамендацыі *Савета Бяспекі ААН*. Статут прадугледжвае прыпыненне ажыццяўлення правоў і прывілеяў дзяржавы — члена ААН або выключэнне з ААН за парушэнне прынцыпаў Статута.

**Колькасны рост Арганізацыі Аб'яднаных Нацый**

| Год уступлення | Колькасць дзяржаў-членаў ААН (на год) | Дзяржавы — члены ААН (у дужках дата прыняцця дзяржавы) |
|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 |
| | | Дзяржавы — заснавальніцы ААН |
| 1945 | 51 | Аргенціна, Беларусь, Бразілія, Вялікабрытанія, Гаіці, Дамініканская Рэспубліка, Данія, Егіпет, ЗША, Іран, Кітай (Рэзалюцыяй Ген. Асамблеі ад 25.10.1971 прадстаўнікі ўрада КНР прызнаны законнымі прадстаўнікамі Кітая ў ААН, а прадстаўнікі Чан Кайшы пазбаўлены гэтых паўнамоцтваў), Куба, Ліван, Люксембург, Нікарагуа, Новая Зеландыя, Парагвай, Польшча, Расійская Федэрацыя (да 24.12.1991 — СССР), Сальвадор, Саудаўская Аравія, Сірыя, Турцыя, Украіна, Філіпіны, Францыя, Чылі, Чэхаславакія, Югаславія (усе 24 кастр.), Грэцыя (25 кастр.), Індыя (30 кастр.), Перу (31 кастр.), Аўстралія (1 ліст.), Коста-Рыка, Ліберыя (2 ліст.), Калумбія (5 ліст.), Мексіка, Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка (7 ліст.), Канада (9 ліст.), Панама, Эфіопія (13 ліст.), Балівія (14 ліст.), Венесуэла (15 ліст.), Гватэмала (21 ліст.), Нарвегія (27 ліст.), Нідэрланды (10 снеж.), Гандурас (17 снеж.), Уругвай (18 снеж.), Ірак, Эквадор (21 снеж.), Бельгія (27 снеж.) |
| | | Новыя дзяржавы — члены ААН |
| 1946 | 55 | Афганістан, Ісландыя, Швецыя (19 ліст.), Тайланд (16 снеж.) |
| 1947 | 57 | Емен, Пакістан (30 вер.) |
| 1948 | 58 | М'янма (19 крас.) |
| 1949 | 59 | Ізраіль (11 мая) |
| 1950 | 60 | Інданезія (28 вер.) |
| 1955 | 76 | Албанія, Аўстрыя, Балгарыя, Венгрыя, Іарданія, Ірландыя, Іспанія, Італія, Камбоджа, Лаоская Народна-Дэмакратычная Рэспубліка, Лівійская Арабская Джамахірыя, Непал, Партугалія, Шры-Ланка, Румынія, Фінляндыя (усе 14 снеж.) |
| 1956 | 80 | Марока, Судан, Туніс (усе 12 ліст.), Японія (18 снеж.) |
| 1957 | 82 | Гана (8 сак.), Малайзія (17 вер.) |
| 1958 | 83 | Гвінея (12 снеж.) |
| 1960 | 100 | Бенін, Буркіна-Фасо, Габон, Заір, Камерун, Кіпр, Конга, Кот-д'Івуар, Мадагаскар, Нігер, Самалі, Тога, Цэнтральнаафрыканская Рэспубліка, Чад (усе 20 вер.), Малі, Сенегал (28 вер.), Нігерыя (7 кастр.) |
| 1961 | 104 | Манголія, Маўрытанія, Сьера-Леоне (усе 27 кастр.), Аб'яднаная Рэспубліка Танзанія (14 снеж.) |
| 1962 | 110 | Бурундзі, Руанда, Трынідад і Табага, Ямайка (усе 18 вер.), Алжыр (8 кастр.), Уганда (25 кастр.) |
| 1963 | 112 | Кувейт (14 мая), Кенія (16 снеж.) |
| 1964 | 115 | Замбія, Малаві, Мальта (усе 1 снеж.) |
| 1965 | 118 | Гамбія, Мальдыўскія Астравы, Сінгапур (усе 21 вер.) |
| 1966 | 122 | Гаяна (20 вер.), Батсвана, Лесота (17 кастр.), Барбадас (9 снеж.) |
| 1967 | 123 | Дэмакратычны Емен (14 снеж.) |
| 1968 | 126 | Маўрыкій (24 крас.), Свазіленд (24 вер.), Экватарыяльная Гвінея (12 ліст.) |
| 1970 | 127 | Фіджы (13 ліст.) |
| 1971 | 132 | Бахрэйн, Бутан, Катар (усе 21 вер.), Аман (7 кастр.), Аб'яднаныя Арабскія Эміраты (9 снеж.) |
| 1973 | 135 | Багамскія Астравы, Германская Дэмакратычная Рэспубліка, Федэратыўная Рэспубліка Германіі (усе 18 вер.) |
| 1974 | 138 | Бангладэш, Гвінея-Бісау, Грэнада (усе 17 вер.) |
| 1975 | 144 | Каба-Вердэ, Мазамбік, Сан-Таме і Прынсіпі (усе 16 вер.), Папуа—Новая Гвінея (10 кастр.), Каморскія Астравы (12 ліст.), Сурынам (4 снеж.) |
| 1976 | 147 | Сейшэльскія Астравы (21 вер.), Ангола (1 снеж.), Самоа (15 снеж.) |
| 1977 | 149 | В'етнам, Джыбуці (20 вер.) |
| 1978 | 151 | Саламонавы Астравы (19 вер.), Дамініка (18 снеж.) |
| 1979 | 152 | Сент-Люсія (18 вер.) |
| 1980 | 154 | Зімбабве (25 жн.), Сент-Вінсент і Грэнадзіны (16 вер.) |
| 1981 | 157 | Вануату (15 вер.), Беліз (25 вер.), Антыгуа і Барбуда (11 ліст.) |
| 1983 | 158 | Сент-Кітс і Невіс (23 вер.) |
| 1984 | 159 | Бруней (21 вер.) |
| 1990 | 159 | Намібія (23 крас.), Ліхтэнштэйн (18 вер.)<br>22.5.1990 Емен і Дэмакратычны Емен аб'ядналіся ў адну дзяржаву пад назвай Емен (Рэспубліка Емен). 3.10.1990 ГДР і ФРГ аб'ядналіся ў адну дзяржаву — Германію (ФРГ) |
| 1991 | 166 | Карэйская Народна-Дэмакратычная Рэспубліка, Латвія, Літва, Маршалавы Астравы, Мікранезія, Рэспубліка Карэя, Эстонія (усе 17 вер.) |

Продолжение

| 1 | 2 | 3 |
|---|---|---|
| 1992 | 179 | Азербайджан, Арменія, Казахстан, Кыргызстан, Рэспубліка Малдова, Сан-Марына, Таджыкістан, Туркменістан, Узбекістан (усе 2 сак.), Боснія і Герцагавіна, Славенія, Харватыя (усе 22 мая), Грузія (31 ліп.) |
| 1993 | 184 | Славакія, Чэшская Рэспубліка (19 студз., Чэха-Славакія як дзяржава спыніла сваё існаванне), былая Югаслаўская Рэспубліка Македонія (8 крас.), Манака, Эрытрэя (28 мая), Андора (28 ліп.) |
| 1994 | 185 | Палау (16 снеж.) |

На 1.4.1995 членамі ААН з'яўляліся 185 дзяржаў свету.

Гал. органы арг-цыі: Генеральная Асамблея, Савет Бяспекі, *Эканамічны і сацыяльны савет ААН* (ЭКАСОС), *Савет па апецы ААН*, *Міжнародны суд ААН* і *Сакратарыят ААН*.

У Ген. Асамблеі прадстаўлены ўсе члены ААН. Яна можа абмяркоўваць любыя пытанні ў межах Статута або якія адносяцца да

**Сістэма Арганізацыі Аб'яднаных Нацый**

ГЕНЕРАЛЬНАЯ АСАМБЛЕЯ
САВЕТ БЯСПЕКІ
ЭКАНАМІЧНЫ І САЦЫЯЛЬНЫ САВЕТ
САКРАТАРЫЯТ
МІЖНАРОДНЫ СУД
САВЕТ ПА АПЕЦЫ

**Спецыялізаваныя ўстановы і іншыя аўтаномныя арганізацыі сістэмы**

МАГАТЭ
Міжнароднае агенцтва па атамнай энергіі
МАП
Міжнародная арганізацыя працы
ФАО
Харчовая і сельскагаспадарчая арганізацыя Аб'яднаных Нацый
ЮНЕСКА
Арганізацыя Аб'яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры
СААЗ
Сусветная арганізацыя аховы здароўя
Група Сусветнага банка
МБРР
Міжнародны банк рэканструкцыі і развіцця (Сусветны банк)
МАР
Міжнародная асацыяцыя развіцця
МФК
Міжнародная фінансавая карпарацыя
МВФ
Міжнародны валютны фонд
ІКАО
Міжнародная арганізацыя грамадзянскай авіяцыі
СПС
Сусветны паштовы саюз
МСЭ
Міжнародны саюз электрасувязі
СМА
Сусветная метэаралагічная арганізацыя
ІМО
Міжнародная марская арганізацыя
САІУ
Сусветная арганізацыя інтэлектуальнай уласнасці
МФСР
Міжнародны фонд сельскагаспадарчага развіцця
ЮНІДО
Арганізацыя Аб'яднаных Нацый па прамысловым развіцці
ГАТТ
Генеральнае пагадненне па тарыфах і гандлі

**Праграмы і органы ААН (прадстаўнічы пералік)**

БАДАР
Блізкаўсходняе агенцтва ААН для дапамогі палесцінскім бежанцам і арганізацыі работ
МВНІПЖ
Міжнародны вучэбны і навукова-даследчы інстытут па паляпшэнні становішча жанчын
ЦААННП
Цэнтр ААН па населеных пунктах (Хабітат)
ЮНКТАД
Канферэнцыя ААН па гандлі і развіцці
ПКНСААН
Міжнародная праграма ААН па кантролі над наркатычнымі сродкамі
ПРААН
Праграма развіцця Арганізацыі Аб'яднаных Нацый
ЮНЕП
Праграма ААН па навакольным асяроддзі
ЮНФПА
Фонд ААН у галіне народанасельніцтва
УВКБ
Упраўленне Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў
ЮНІСЕФ
Дзіцячы фонд ААН
ЮНІФЕМ
Фонд ААН для развіцця ў інтарэсах жанчын
ЮНІТАР
Вучэбны і навукова-даследчы інстытут ААН
УААН
Універсітэт ААН
СХС
Сусветны харчовы савет
СХП
Сусветная харчовая праграма
ЦМГ
Цэнтр па міжнародным гандлі
ЮНКТАД/ГАТТ
Аперацыі па падтрыманні міру (на 1995)
ОНВУП
Орган ААН па назіранні за выкананнем умоў перамір'я на Блізкім Усходзе
Існуе з чэрвеня 1948
ГВНААНІП
Група ваенных назіральнікаў ААН у Індыі і Пакістане
Існуе са студзеня 1949
УСААНК
Узброеныя сілы ААН па падтрыманні міру на Кіпры
Існуюць з сакавіка 1964
САННР
Сілы Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па назіранні за раз'яднаннем (Галанскія Вышыні)
Існуюць з чэрвеня 1974
ЧСААНЛ
Часовыя сілы ААН у Ліване
Існуюць з сакавіка 1978
ІКМААНН
Ірака-кувейцкая місія ААН па назіранні
Існуе з красавіка 1991
КМААНА ІІ
Кантрольная місія ААН у Анголе ІІ
Існуе з чэрвеня 1991
МНААНС
Місія назіральнікаў ААН у Сальвадоры
Існуе з ліпеня 1991
МААНРЗС
Місія ААН па правядзенні рэферэндуму ў Заходняй Сахары
Існуе з верасня 1991
САААНАБЮ
Сілы ААН па ахове ў былой Югаславіі
Існуюць з сакавіка 1992
ЮНОМОЗ
Аперацыя ААН у Мазамбіку
Існуе са снежня 1992
ЮНОСОМ ІІ
Аперацыя ААН у Самалі ІІ
Існуе з мая 1993
МААНАДГ
Місія ААН па аказанні дапамогі Грузіі
Існуе з жніўня 1993
МНААНЛ
Місія назіральнікаў ААН у Ліберыі
Існуе з верасня 1993
МААНГ
Місія ААН у Гаіці
Існуе з верасня 1993
МААНДР
Місія ААН па аказанні дапамогі Руандзе
Існуе з кастрычніка 1993
МААННТ
Місія ААН па назіранні ў Таджыкістане
Існуе са снежня 1994

**Іншыя камітэты, камісіі, спецыяльныя і звязаныя з імі органы**

Галоўныя і іншыя сесійныя камітэты
Пастаянныя камітэты і спецыяльныя органы
Іншыя дапаможныя і звязаныя з імі органы
Ваенна-штабны камітэт

ФУНКЦЫЯНАЛЬНЫЯ КАМІСІІ
Камісія сацыяльнага развіцця
Камісія па папярэджанні злачыннасці і крымінальным правасуддзі
Камісія па правах чалавека
Камісія па наркатычных сродках
Камісія па навуковым і тэхнічным развіцці
Камісія па ўстойлівым развіцці
Камісія па становішчы жанчын
Камісія па народанасяленні
Статыстычная камісія

РЭГІЯНАЛЬНЫЯ КАМІСІІ
Эканамічная камісія для Афрыкі (ЭКА)
Еўрапейская эканамічная камісія (ЕЭК)
Эканамічная камісія для Лацінскай Амерыкі і Карыбскага басейна (ЭКЛАК)
Эканамічная і сацыяльная камісія для Азіі і Ціхага акіяна (ЭСКАЦА)
Эканамічная і сацыяльная камісія для Заходняй Азіі (ЭСКЗА)

СЕСІЙНЫЯ І ПАСТАЯННЫЯ КАМІТЭТЫ ЭКСПЕРТНЫЯ, СПЕЦЫЯЛЬНЫЯ І ЗВЯЗАНЫЯ З ІМІ ОРГАНЫ

паўнамоцтваў і функцый любога з органаў ААН, даваць рэкамендацыі Савету Бяспекі і яго членам па любым з такіх пытанняў, за выключэннем тых, на якія распаўсюджваюцца паўнамоцтвы Савета Бяспекі; вызначае мэты і кіруе дзейнасцю ў галіне развіцця, склікае сусв. канферэнцыі, абвяшчае міжнар. гады і г.д. Паводле Статута ААН на Савет Бяспекі ўскладзена гал. адказнасць за падтрыманне міру і бяспекі. Ён складаецца з 5 пастаянных (Вялікабрытанія, ЗША, Кітай, Расія і Францыя) і 10 непастаянных (выбіраюцца Ген. Асамблеяй на 2 гады) членаў. Дзейнічае паводле прынцыпу аднагалосся. Рашэнні Савета Бяспекі абавязковыя для ўсіх членаў ААН. У выключную кампетэнцыю Савета Бяспекі ўваходзіць вырашэнне пытанняў стварэння і функцыянавання *ўзброеных сіл ААН*. Эканам. і сац. савет каардынуе пад эгідай Ген. Асамблеі дзейнасць ААН у галіне эканам. і сац. супрацоўніцтва. Складаецца з 54 чал., якія выбіраюцца Ген. Асамблеяй. Задача Савета па апецы — назіранне за кіраўніцтвам падапечнымі тэрыторыямі, якія ўключаны ў сістэму апекі. Міжнар. суд — гал. суд. орган ААН. Яго члены выбіраюцца Ген. Асамблеяй і Саветам Бяспекі. Сакратарыят абслугоўвае інш. органы ААН, выконвае праграмы і ажыццяўляе прынятую імі палітыку. Узначальвае Сакратарыят *Генеральны сакратар ААН* (з 1.1.1993 Бутрас *Бутрас-Галі*).

Існуе вял. колькасць розных органаў ААН: спец. камітэты, камісіі, канферэнцыі і інш. Асобна вылучаюцца *спецыялізаваныя ўстановы ААН*, якія дзейнічаюць аўтаномна, маюць свае ўстановы і членства. Штаб-кватэра ААН размешчана ў Нью-Йорку. У шэрагу гарадоў свету дзейнічаюць інфарм. цэнтры і розныя службы арг-цыі. У Вене і Жэневе размешчаны Аддзяленні ААН. Афіц. мовы ААН — англ., ісп., кіт., рус., франц.; араб. мова дабаўлена як афіц. мова Ген. Асамблеі, Савета Бяспекі і ЭКАСОС. Мае сваю эмблему і сцяг. У Мінску дзейнічае *Прадстаўніцтва ААН у Рэспубліцы Беларусь*.

*В.М.Іваноў, Г.К.Кісялёў.*

## АРГАНІЗА́ЦЫЯ АБ'ЯДНА́НЫХ НА́ЦЫЙ ПА ПРАМЫСЛО́ВЫМ РАЗВІЦЦІ

(United Nations Industrial Development Organization; ЮНІДО), міжурадавая арг-цыя ў сістэме ААН. Створана ў 1966. Паводле статута (прыняты ў 1979 у Вене) ЮНІДО аўтаномная спецыялізаваная ўстанова (з 1986). Чл. арганізацыі з'яўляюцца 147 дзяржаў (1990).

Асн. мэты і віды дзейнасці: дапамога краінам, што развіваюцца, у правядзенні і паскарэнні індустрыялізацыі, распрацоўка і каардынацыя з гэтай нагоды мерапрыемстваў ААН; садзейнічанне ва ўмацаванні супрацоўніцтва паміж індустрыяльна развітымі краінамі і тымі, што стаяць на шляху развіцця; правядзенне адпаведных кансультацый і перагавораў, падтрымка інвестыцыйных працэсаў, перадача тэхналогій і г.д. Аказвае тэхн. дапамогу, распрацоўвае праграмы падрыхтоўкі кадраў для прам-сці, выступае як цэнтр па зборы, сістэматызацыі і распаўсюджванні прамысл. інфармацыі.

Асн. органы — Ген. канферэнцыя, Савет па прамысл. развіцці і К-т па праграме і бюджэце. Штаб-кватэра арг-цыі ў Вене.

## АРГАНІЗА́ЦЫЯ АБ'ЯДНА́НЫХ НА́ЦЫЙ ПА ПЫТА́ННЯХ АДУКА́ЦЫІ, НАВУ́КІ І КУЛЬТУ́РЫ

(United Nations Educational Scientific and Cultural Organisation; ЮНЕСКА), спецыялізаваная міжурадавая ўстанова ААН, якая садзейнічае ўмацаванню міру і міжнар. бяспекі праз развіццё супрацоўніцтва паміж дзяржавамі ў галіне адукацыі, навукі і культуры. Створана на Лонданскай устаноўчай канферэнцыі ў ліст. 1945, афіцыйна дзейнічае з 4.11.1946 (з дня ўступлення ў сілу Статута ЮНЕСКА). На пач. 1995 членства ў ЮНЕСКА мела 171 дзяржава, у т.л. Рэспубліка Беларусь (з 1954, разам з СССР і Украінай). Кіруючыя органы ЮНЕСКА: Генеральная канферэнцыя, Выканаўчы савет і Сакратарыят, які ўзначальваецца Генеральным дырэктарам. Ген. канферэнцыя — вышэйшы орган, які вызначае стратэгію дзейнасці ЮНЕСКА, — склікаецца на чарговыя сесіі раз у 2 гады; у ёй прымаюць удзел прадстаўнікі ўсіх дзяржаў — членаў ЮНЕСКА. На канферэнцыі зацвярджаецца праграма і бюджэт арг-цыі, фарміруецца Выканаўчы савет, прызначаецца Ген. дырэктар (тэрмінам на 6 гадоў), прымаюцца канвенцыі і рэкамендацыі, новыя члены арг-цыі. Паміж сесіямі арг-цыяй кіруе Выканаўчы савет, які складаецца з 51 прадстаўніка. У склад Сакратарыята ўваходзяць сектары: адукацыі, прыродазнаўчых навук, грамадскіх навук, камунікацый, супрацоўніцтва, знешніх зносін. Сектары ўзначальваюць намеснікі Ген. дырэктара. Штаб-кватэра ЮНЕСКА ў Парыжы.

Эмблема Арганізацыі аб'яднаных нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры (ЮНЕСКА).

Дзейнасць ЮНЕСКА ажыццяўляецца паводле сярэднетэрміновых і кароткатэрміновых (2-гадовых) планаў, у якіх сфармуляваны агульныя кірункі дзейнасці, распрацаваныя на аснове аналізу актуальных праблем. Праграмныя галіны дзейнасці ЮНЕСКА ў 1994—95: адукацыя і будучыня; навука ў інтарэсах прагрэсу і навакольнае асяроддзе; культура — мінулае, сучаснае і будучае; камунікацыя — інфармацыя і інфарматыка на службе чалавецтва; сац. і гуманіт. развіццё навукі — уклад у развіццё міру, правоў чалавека і дэмакратыі. Праграмы ажыццяўляюцца ў форме канферэнцыі, нарады, сімпозіума, міжнар. кампаніі, збору, аналізу і распаўсюджвання стат. даных, садзейнічання дзяржавам у правядзенні рэстаўрацыйных работ, стварэння навуч. устаноў, іх абсталявання, накіравання экспертаў, кансультацый, дапамогі ў распрацоўцы навук. і навуч. праграм. Важная форма дзейнасці ЮНЕСКА па пашырэнні нац. і міжнар. супрацоўніцтва і ўзаемаразумення — распрацоўка міжнар. канвенцый, дэкларацый, рэкамендацый (напр., Усеагульная канвенцыя аб аўтарскім праве 1952, Канвенцыя аб ахове сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны 1972, Рэкамендацыя аб развіцці адукацыі дарослых 1978 і інш.). Для кіравання асобнымі праграмамі Ген. канферэнцыя можа ствараць дапаможныя к-ты і камісіі. Так, для кіравання праграмай «ЮНЕСКА — Чарнобыль» створаны спец. камітэт. У рэалізацыі праграм ЮНЕСКА удзельнічаюць нац. камісіі, якія выконваюць кансультатыўныя функцыі пры дэлегацыі сваёй краіны на Ген. канферэнцыі або пры сваім урадзе. У Рэспубліцы Беларусь нац. камісія па справах ЮНЕСКА створана ў 1956. Узначальвае яе, як правіла, міністр замежных спраў. ЮНЕСКА выпускае 26 перыяд. выданняў на розных мовах. Найб. папулярны сярод іх штомесячнік «Курьер ЮНЕСКО».

*Літ.*: Языкович Л.В. Деятельность Белорусской ССР в ЮНЕСКО. Мн., 1986.

*Л.В.Паўлава.*

## АРГАНІЗА́ЦЫЯ АЗІЯ́ЦКА-ЦІХААКІЯ́НСКАГА ЭКАНАМІ́ЧНАГА СУПРАЦО́ЎНІЦТВА

(Asia-Pacific Economic Cooperation Conference; АЦЭС), аб'яднанне краін Азіяцка-Ціхаакіянскага рэгіёна. Створана ў 1989. Уваходзяць (1995): Аўстралія, Бруней, ЗША, Інданезія, Канада, Кітай, Малайзія, Мексіка, Новая Зеландыя, Папуа-Новая Гвінея, Паўд. Карэя, Сінгапур, Сянган (Ганконг), Тайвань, Тайланд, Філіпіны, Чылі, Японія. Асн. мэты: лібералізацыя гандлю, інвестыцый, руху капіталаў і тэхналогій. Вышэйшы орган — Канферэнцыя кіраўнікоў урадаў. Штаб-кватэра ў Сінгапуры. *Дз.В.Панамароў.*

## АРГАНІЗА́ЦЫЯ АМЕРЫКА́НСКІХ ДЗЯРЖА́Ў

(Organization of American States; ААД), рэгіянальная арг-цыя дзяржаў Паўн., Цэнтр. і Паўд. Амерыкі. Створана ў 1948 на 9-й Міжамер. канферэнцыі ў Багаце (Калумбія). Уваходзяць 35 дзяржаў (акрамя Кубы; 1991). Асн. мэты — падтрымка міру ў зах. паўшар'і, забеспячэнне калект. бяспекі і мірнага вырашэння праблем; спрыянне эканам., сац. і культ. супрацоўніцтву; каардынацыя дзейнасці розных міжамер. арг-цый. У 1959 створаны Міжамер. банк развіцця. Вышэйшыя органы ААД — міжамер. канферэнцыя (збіраецца кожныя 5 гадоў), ген. асамблея міністраў замежных спраў, пастаянны савет (кожная дзяржава прадстаўлена паслом), ген. сакратарыят (знаходзіцца ў Вашынгтоне).

**АРГАНІЗА́ЦЫЯ АФРЫКА́НСКАГА АДЗІ́НСТВА** (Organization of African Unity; ААА), рэгіянальная міжурадавая арг-цыя незалежных дзяржаў Афрыкі. Засн. ў 1963 у Адыс-Абебе (Эфіопія). Уваходзіць 51 дзяржава (1991). Мэты — барацьба супраць каланіялізму ва ўсіх яго формах і праявах, рацыянальнае выкарыстанне рэсурсаў кантынента, развіццё супрацоўніцтва і каардынацыя дзеянняў у палітыцы, эканоміцы, абароне, навуцы, культуры і інш. Створаны Афр. банк развіцця, Ін-т эканам. планавання. 2-я Асамблея ААА (Кіпр, чэрв. 1964) абвясціла Афрыку бязатамнай зонай. Вышэйшы орган — штогадовая Асамблея кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў, выканаўчы орган — Савет Міністраў, пастаянны адм. орган — Сакратарыят, дзейнічаюць пастаянныя камісіі, сакратарыят афр. групы дзяржаў пры ААН. Штаб-кватэра ў Адыс-Абебе.

**АРГАНІЗА́ЦЫЯ БЕЛАРУ́СКА-АМЕРЫКА́НСКАЙ МО́ЛАДЗІ** ў ЗША (АБАМ). Створана 30.12.1951 аб'яднаннем арг-цый бел. моладзі ў Кліўлендзе і Нью-Йорку. Да 1967 наз. Згуртаванне бел. моладзі ў Амерыцы. Мае аддзяленні ў Дэтройце, Кліўлендзе, Лос-Анджэлесе, Нью-Брансвіку, Саўт-Рыверы. З 1960 член Еўрап. ін-та (ін-та выхавання моладзі еўрап. бежанцаў). Пры арг-цыі існуе (з 1977) фонд падтрымкі студэнтаў імя Любачкі. АБАМ займаецца культ.-асв., грамадска-арганізац. і інфарм.-выдавецкай дзейнасцю. Выдавала часопісы «Віщі» (1952—57, разам з Бел.-амер. студэнцкім аб'яднаннем), «Беларуская моладзь» (1959—80, на бел. і англ. мовах), выйшаў «Беларускі песенны зборнік» М.Куліковіча (Кліўленд, 1960). Пры АБАМ у 1956—93 дзейнічаў танц. ансамбль «Васілёк».

*А.С.Ляднёва.*

**АРГАНІЗА́ЦЫЯ ВАРШАЎСКАГА ДАГАВО́РУ**, гл. ў арт. *Варшаўскі дагавор 1955.*

**АРГАНІЗА́ЦЫЯ ВЫЗВАЛЕ́ННЯ ПАЛЕСЦІ́НЫ** (АВП), галоўная арг-цыя палесцінскага нац.-выз. руху. Створана ў 1964. Уключае большасць арг-цый Палесцінскага руху супраціўлення і грамадска-паліт. аб'яднанняў, якія актыўна змагаюцца за правы араб. народа Палесціны. Мае ўзбр. сілы, прадстаўніцтвы больш як у 100 краінах, чл. Лігі араб. краін, Арг-цыі «Ісламская канферэнцыя», з 1974 — адзіны законны прадстаўнік араб. народа Палесціны ў ААН. Вышэйшы орган — Нац. савет Палесціны (НСП, склікаецца раз у год, лічыцца палесцінскім парламентам у выгнанні), які ў 1988 прыняў рашэнне пра стварэнне Дзяржавы Палесціна на тэр. зах. берага р. Іардан і сектара Газа. Паліт. і арганізац. кіраўніцтва АВП ажыццяўляе яе Выканком (надзелены НСП паўнамоцтвамі часовага палесцінскага ўрада); з 1969 старшыня Выканкома АВП *Я.Арафат*. Гал. інфарм. агенцтва АВП выдае штотыднёвік «Філастын ас-Саура» («Рэвалюцыйная Палесціна»).

Палітыка АВП доўгі час будавалася на ўзбр. барацьбе супраць Ізраіля за вызваленне акупіраваных ім тэрыторый і непрыняцці рэзалюцыі Ген. Асамблеі ААН ад 29.11.1947 пра стварэнне на тэр. Палесціны яўр. і араб. дзяржаў. З канца 1980 — пач. 1990-х г. стала на шлях перагавораў і пошуку мірнага ўрэгулявання палесцінскай праблемы: прызнала рэзалюцыі Ген. Асамблеі ААН ад 29.11.1947 і Савета Бяспекі ад 22.11.1967 і 22.10.1973; паводле Вашынгтонскай дэкларацыі 1993 прадугледжана часовае палесцінскае самакіраванне на тэр. зах. берага р. Іардан сектара Газа. АВП і Ізраіль заявілі пра ўзаемнае прызнанне.

**АРГАНІЗА́ЦЫЯ ВЫТВО́РЧАСЦІ**, аптымальнае спалучэнне рабочай сілы, сродкаў і прадметаў працы ў працэсе вытв-сці тавараў (паслуг) на аснове падзелу працы, абавязкаў і пэўнай іерархічнай структуры з мэтай дасягнення максімальнай сац.-эканам. эфектыўнасці. Ахоплівае асн., дапаможную і абслуговую вытв-сць, а таксама *кіраванне вытворчасцю* як гарманічна ўвязаныя звёны адзінага працэсу вырабу прадукцыі. А.в. павінна забяспечыць: бесперапыннасць (выкарыстанне сродкаў працы з мінімальнымі стратамі часу, няспынны рух прадметаў працы праз усе стадыі вытв-сці), прапарцыянальнасць (узаемная адпаведнасць сумежных участкаў, што дазваляе больш поўна выкарыстаць іх вытв. магутнасці), рытмічнасць (раўнамерны выпуск прадукцыі і выкананне аднолькавага аб'ёму работ у роўныя адрэзкі часу). Найважнейшыя формы А.в.: камбінаванне, канцэнтрацыя, спецыялізацыя. Важнейшыя метады А.в.: непаточны, паточны, аўтаматызаваны; адзінкавы серыйны і масавы тыпы вытв-сці. Кожнае прадпрыемства канкрэтызуе А.в. з улікам асаблівасцяў сваёй галіны, віду прадукцыі (паслуг), ступені падзелу працы. Існуюць і агульныя, характэрныя для ўсіх прадпрыемстваў стадыі А.в.: тэхнічнай падрыхтоўкі вытворчасці (праектаванне, вытв-сць новых відаў прадукцыі і арганізацыя для гэтых мэтаў канструктарскай, тэхнал. і арганізацыйна-эканам. падрыхтоўкі вытв-сці); стварэнне рацыянальнай вытворчай структуры і арганізацыя асноўных вытворчых працэсаў (склад і структура вытв. падраздзяленняў, рэгламент іх работы, забеспячэнне бесперабойнасці вытв. працэсу); тэхнічнае абслугоўванне вытворчасці (кваліфікаванае абслугоўванне найперш асн. вытв-сці, каб забяспечыць рытмічны выпуск прадукцыі высокай якасці); функцыянальная дзейнасць прадпрыемства (аператыўная, кваліфікаваная і ўзаемазладжаная работа спецыялістаў усіх службаў); рацыянальная арганізацыя кіравання вытворчасцю. На ўсіх стадыях А.в. найважнейшае значэнне мае рацыянальная *арганізацыя працы*. Асн. патрабаванні да вытв. структуры: прастата, пяткасць і эканамічнасць, якія дасягаюцца змяншэннем колькасці вытв. падраздзяленняў, іх узбуйненнем, пераходам на бясцэхавую структуру кіравання, укараненнем найноўшых тэхнікі і тэхналогій, спецыялізацыяй і канцэнтрацыяй вытворчасці. Эфектыўнасць А.в. заключаецца ў змяншэнні выдаткаў вытв-сці, павышэнні прадукцыйнасці працы. Абагульняльны паказчык эфектыўнасці А.в. — павелічэнне прыбытку ад рэалізаванай прадукцыі ў разліку на 1 руб. сродкаў, укладзеных у работу прадпрыемства.

*Г.Я.Кажэкін.*

**АРГАНІЗА́ЦЫЯ ДАГАВО́РУ ПАЎДНЁВА-УСХО́ДНЯЙ А́ЗІІ** (South-East Asia Treaty Organization; СЕАТО), ваенна-паліт. рэгіянальная арганізацыя ў Паўд.-Усх. Азіі ў 1954—77. Створана ў вер. 1954 у Маніле паводле Паўд.-Азіяцкага дагавору аб калект. абароне. Уваходзілі Аўстралія, Вялікабрытанія, ЗША, Новая Зеландыя, Пакістан (выйшаў у 1973), Тайланд, Філіпіны, Францыя (з 1965 абмежавала, з 1974 спыніла ўдзел у арг-цыі). Штаб-кватэра знаходзілася ў Бангкоку. У 1975 Тайланд і Філіпіны выказаліся за роспуск блока. У чэрв. 1977 дзейнасць арг-цыі спынена.

**АРГАНІЗА́ЦЫЯ ІСЛА́МСКАЯ КАНФЕРЭ́НЦЫЯ**, Арганізацыя Ісламскі кангрэс (АІК), міждзяржаўная паліт.-рэлігійная арг-цыя. Створана ў 1971 у Рабаце (Марока). Аб'ядноўвае 45 мусульм. краін (1991) на ідэі панісламізму. Мэты — умацаванне салідарнасці мусульм. краін, развіццё эканам., сац., культ. і навук. супрацоўніцтва паміж імі. Найвыш. орган — канферэнцыя кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў краін-удзельніц (збіраецца кожныя 3 гады). Штаб-кватэра ў Джыдзе (Саудаўская Аравія).

**АРГАНІЗА́ЦЫЯ КРАІ́Н—ЭКСПАРЦЁРАЎ НА́ФТЫ** (Organisation of Petroleum Exporting Countries; ОПЭК). Засн. ў 1960. Члены — 13 краін: Аб'яднаныя Арабскія Эміраты, Алжыр, Венесуэла, Габон, Інданезія, Ірак, Іран, Катар, Кувейт, Лівія, Нігерыя, Саудаўская Аравія, Эквадор. Мэты: каардынацыя і уніфікацыя нафтавай палітыкі краін-удзельніц; забеспячэнне стабільнасці цэн на міжнар. нафтавых рынках для атрымання ўстойлівых даходаў краін — чл. АПЭК, эфектыўных і рэгулярных паставак нафты краінам-спажыўцам. Кантралюе каля 85% сусв. аб'ёму гандлю нафтай, устанаўлівае афіц. цану на сырую нафту, што ў многім вызначае сусв. ўзровень цэнаў на нафту. Штаб-кватэра ў Вене.

**АРГАНІЗА́ЦЫЯ МІЖНАРО́ДНАЙ ГРАМАДЗЯ́НСКАЙ АВІЯ́ЦЫІ** (Inter-

national Civil Aviation Organization; ІКАО), спецыялізаваная ўстанова ААН па супрацоўніцтве дзяржаў у галіне грамадзянскай авіяцыі. Засн. ў 1944 на аснове Чыкагскай канвенцыі аб міжнар. грамадз. авіяцыі. Членамі яе з'яўляюцца каля 150 краін. Гал. мэты: распрацоўка і уніфікаванне тэхн. правілаў, якія рэгулююць міжнар. палёты і эксплуатацыю паветр. суднаў, аэрадромаў, аэранавігацыйных сродкаў; тэхн. дапамога ў арганізацыі грамадз. авіяцыі і кіраванні ёю. Штаб-кватэра ў Манрэалі.

**АРГАНІЗА́ЦЫЯ ПА БЯСПЕ́ЦЫ І СУПРАЦО́ЎНІЦТВЕ Ў ЕЎРО́ПЕ** (АБСЕ), міжнар. арг-цыя. Склалася да сярэдзіны 1990-х г. у выніку дзейнасці Нарады па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (НБСЕ). На пач. 1970-х г. СССР і яго партнёры па Арг-цыі Варшаўскага дагавору (гл. *Варшаўскі дагавор 1955*) ініцыіравалі скліканне нарады еўрап. дзяржаў для абмеркавання захадаў, якія забяспечылі б калект. бяспеку ў Еўропе. Ва ўмовах паляпшэння адносін паміж СССР, ЗША і краінамі Зах. Еўропы ў г. Хельсінкі адбыліся папярэднія шматбаковыя кансультацыі (ліст. 1972 — чэрв. 1973) і пасяджэнні міністраў замежных спраў 33 еўрап. дзяржаў (акрамя Албаніі), ЗША і Канады (ліп. 1973). 2-і этап перагавораў аб скліканні НБСЕ прайшоў у вер. 1973 — ліп. 1975 у Жэневе. 30.7.1975 у Хельсінкі на ўзроўні кіраўнікоў урадаў 35 дзяржаў пачалася нарада, 1.8.1975 падпісаны *Заключны акт Нарады па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе*. У 1977—94 адбыўся шэраг сустрэч прадстаўнікоў дзяржаў — удзельніц НБСЕ. У 1991 удзельнікамі НБСЕ сталі Албанія, Эстонія, Латвія, Літва, у 1992 — Беларусь і інш. краіны. На сустрэчы ў Будапешце (5—6.12.1994) кіраўнікі дзяржаў і ўрадаў 52 краін (без Югаславіі), прынялі рашэнне аб пераўтварэнні НБСЕ у АБСЕ, падпісалі мемарандумы аб гарантыі бяспекі Украіны, Беларусі і Казахстана, прынялі паліт. дэкларацыю «Да сапраўднага партнёрства ў новую эпоху», якая вызначае ролю, месца і задачы АБСЕ ў пабудове будучай Еўропы. Органамі АБСЕ (з 1990) з'яўляюцца: сустрэчы кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў (адбываюцца кожныя 2 гады); Савет міністраў замежных спраў (засядае не менш як 1 раз на год); Сакратарыят з рэзідэнцыяй у Празе; Цэнтр па прадухіленні канфліктаў (Вена); бюро «За свабодныя выбары» (Варшава, ажыццяўляе назіранне за выбарамі); Парламенцкі сход АБСЕ; Камітэт вышэйшых дзярж. службовых (у ліку абавязкаў падрыхтоўка пасяджэнняў).

**АРГАНІЗА́ЦЫЯ ПАЎНОЧНААТЛАНТЫ́ЧНАГА ДАГАВО́РУ** (North Atlantic Treaty Organization; НАТО), ваенна-паліт. арганізацыя, створаная на аснове падпісанага 4.4.1949 у Вашынгтоне Паўн.-Атлантычнага дагавору. Першапачатковыя ўдзельнікі: Бельгія, Вялікабрытанія, Данія, ЗША, Ісландыя, Італія, Канада, Люксембург, Нарвегія, Нідэрланды, Партугалія, Францыя; пазней далучыліся Грэцыя і Турцыя (1952), ФРГ (1955), Іспанія (1982). Асн. мэты арг-цыі — гарантаванне бяспекі, свабоды і міру краінам-удзельніцам.

На пачатку існавання палітыка НАТО фарміравалася ў атмасферы «халоднай вайны» і гонкі ўзбраенняў, выкліканых узбр. і паліт. процістаяннем ЗША і СССР, НАТО і арг-цыі краін *Варшаўскага дагавору 1955*. Пасля распаду сацыяліст. сістэмы, СССР і спынення дзейнасці Варшаўскага дагавору (1991) палітыка НАТО істотна змянілася. У 1991 прынята Рымская дэкларацыя аб міры і супрацоўніцтве. Дзеля большай бяспекі ў Еўропе створаны Савет Паўн.-Атлантычнага супрацоўніцтва. У вер. 1994 на сесіі Савета НАТО прынята праграма «Партнёрства дзеля міру», адкрытая для далучэння ўсіх краін Усх. Еўропы (Беларусь далучылася ў 1994).

Вышэйшыя органы НАТО — сесія Савета НАТО і К-т ваеннага планавання, якія збіраюцца 2 разы на год. Паміж сесіямі Савет працуе як пастаянны Савет НАТО ў складзе пастаянных прадстаўнікоў дзяржаў-удзельніц. Бягучую работу і падрыхтоўку сесій вядзе Міжнар. сакратарыят на чале з Ген. сакратаром НАТО. У ваен. арганізацыі НАТО вышэйшы орган — К-т ваен. планавання, выканаўчы — Ваенны к-т, якому падначалены Вярх. штаб аб'яднаных узбр. сіл НАТО. Штаб-кватэра арг-цыі ў Бруселі (да 1967 была ў Парыжы).

**АРГАНІЗА́ЦЫЯ ПРА́ЦЫ**, стварэнне аптымальнай сістэмы працоўнай дзейнасці людзей. Сутнасць А.п. ў межах асобнага прац. калектыву — у рацыянальным выкарыстанні рабочай сілы. Уключае: падбор і прафес. падрыхтоўку кадраў; аптымальную расстаноўку работнікаў у адпаведнасці з падзелам і кааперацыяй працы і вытв. задачамі; арганізацыю рабочых месцаў; нарміраванне, дысцыпліну і стымуляванне працы. Для эфектыўнага выкарыстання рабочай сілы ў вытв. працэсе ўводзіцца *навуковая арганізацыя працы*. Грамадская А.п. звязана з многімі фактарамі ў краіне: умовамі занятасці насельніцтва, падзелам і кааперацыяй працы, размеркаваннем яе вынікаў паміж членамі грамадства і інш.

**«АРГАНІЗА́ЦЫЯ ТО́ТА»**, паўваенная спецыялізаваная арг-цыя ў фаш. Германіі ў 1938—45 (назва ад прозвішча яе заснавальніка — нацыста інжынера Ф.Тота). У 2-ю сусв. вайну займалася буд-вам і рамонтам шашэйных дарог, мастоў, аэрадромаў, умацаванняў і іншых ваен. аб'ектаў, у т.л. на акупіраванай Беларусі. Летам 1941 падраздзяленні «А.Т.» рухаліся за наступаючымі ням. войскамі, аднаўлялі разбураныя камунікацыі, выкарыстоўваючы працу ваеннапалонных і цывільнага насельніцтва. У 1943—44 арг-цыя ўдзельнічала ў стварэнні герм. стратэгічнага абарончага рубяжа — «Усходняга вала» па лініі р. Нарва—Пскоў—Віцебск—Орша—сярэдняе цячэнне р. Дняпро — рэкі Сож і Малочная. Падраздзяленні «А.Т.» існавалі ў Мінску, Віцебску, Гомелі, Слуцку і ў інш. нас. пунктах.

**АРГАНІЗА́ЦЫЯ ЎКРАІ́НСКІХ НАЦЫЯНАЛІ́СТАЎ** (АУН), украінская паліт. арганізацыя. Створана ў 1929 Я.Канавальцам. У сваёй праграме абвяшчала непрымірымыя адносіны да камунізму. Паставіла сябе над інш. ўкр. партыямі і рухамі, пачаўшы з імі барацьбу. Імкнулася пры дапамозе ўсенар. паўстання аб'яднаць усе ўкр. землі ва Укр. Самастойную Саборную Дзяржаву (УССД). У 1940 з-за ўнутр. рознагалоссяў распалася на АУН (м) — мельнікаўцаў і АУН (б) — бандэраўцаў (паводле прозвішчаў кіраўнікоў — А.Мельніка і С.Бандэры). На пач. 2-й сусв. вайны выступіла супраць Польшчы, потым супраць СССР на баку Германіі. Пасля адмовы гітлераўскіх уладаў прызнаць Акт аднаўлення Украінскай Дзяржавы (30.6.1941) АУН (б) перайшла ў апазіцыю да акупац. рэжыму, разгарнула супраць яго прапаганду. На гэта фашысты адказалі арыштамі і расстрэламі бандэраўцаў. Мельнікаўцы стаялі на змоўніцкіх пазіцыях да фашыстаў. Вясной 1943 АУН (б) абвясціла стратэгію «двухфронтавой» барацьбы супраць Берліна і Масквы — «Украінская паўстанцкая армія» («УПА») пачала на Валыні і бел.-ўкр. Палессі дзеянні супраць гітлераўцаў і сав. партызанаў. З 1944 гал. сілы АУН разгарнулі антысав. барацьбу, якая ахапіла пераважна зах. вобласці Украіны і працягвалася да сярэдзіны 1950-х г. Пасля вайны асн. кадры абедзвюх частак АУН былі ў эміграцыі. З абвяшчэннем дзярж. суверэнітэту Украіны ў 1991 АУН перанесла сваю дзейнасць на радзіму і скіравала яе на пабудову дэмакр., паліт. і эканам. незалежнай укр. дзяржавы. *А.В.Кенцій.*

**АРГАНІЗА́ЦЫЯ ЦЭНТРАЛЬНААМЕРЫКА́НСКІХ ДЗЯРЖА́Ў** (Organization of Central American States; АЦАД), рэгіянальная арг-цыя дзяржаў Цэнтр. Амерыкі. Створана ў 1951. Аб'ядноўвае Гандурас, Гватэмалу, Коста-Рыку, Нікарагуа, Сальвадор. Статут прадугледжвае магчымасць далучэння Панамы. Паводле Хартыі 1965 мэта арг-цыі — узаемадапамога, эканам., сац. і паліт. супрацоўніцтва ў Цэнтр. Амерыцы. Вышэйшыя органы — нарады кіраўнікоў краін-удзельніц і міністраў замежных спраў. Штаб-кватэра ў Сан-Сальвадоры.

**АРГАНІЗА́ЦЫЯ ЦЭНТРА́ЛЬНАГА ДАГАВО́РУ** (The Central Treaty Organization; СЕНТО), ваенна-паліт. арганізацыя на Б. і Сярэднім Усходзе ў 1955—79, да сак. 1959 наз. Арг-цыя Дагавору Блізкага Усходу. Дагавор аб яе стварэнні падпісаны ў 1955 у Багдадзе (Багдадскі пакт). Уваходзілі Ірак (выйшаў у 1958), Іран, Пакістан, Турцыя і

Вялікабрытанія, у 1959 далучыліся ЗША. Пасля выхаду з СЕНТО Ірана і Пакістана (1979) па ініцыятыве Турцыі арг-цыя спыніла сваю дзейнасць.

**АРГАНІЗА́ЦЫЯ ЭКАНАМІ́ЧНАГА СУПРАЦО́ЎНІЦТВА І РАЗВІЦЦЯ́** (Organization for Economic Cooperation and Development; АЭСР), міждзяржаўная арг-цыя. Створана ў 1961 у Парыжы. Уваходзяць 18 еўрап. краін, а таксама ЗША, Канада, Аўстралія, Новая Зеландыя, Японія, Турцыя (1994). Асн. мэты арг-цыі — імкненне да эканам. росту, павышэння ўзроўню жыцця і занятасці насельніцтва, падтрыманне фін. стабільнасці праз лібералізацыю міжнар. гандлю і руху капіталу, праз каардынацыю эканам. дапамогі менш развітым краінам. Кожная краіна-ўдзельніца прадстаўлена пастаяннай дэлегацыяй у Савеце АЭСР. Штаб-кватэра ў Парыжы.

**АРГАНІЦЫ́ЗМ**, вучэнне, што растлумачвае прыродныя і сац. з'явы (працэсы) па аналогіі з біял. будовай арганізма. У яго аснову пакладзены прынцып біял. цэласнасці, які раскрывае найважнейшыя асаблівасці развіцця жывога (арганізм як цэласная сістэма, развіццё да ўсё больш складанай арганізацыі, іерархічная ўпарадкаванасць, адносная ўстойлівасць і самарэгуляцыя). Тэрмін «А.» уведзены ў 1918 англ. фізіёлагам Дж.С.Холдэйнам, які разам са сваімі паслядоўнікамі (Дж.Вуджэр, Г.Шаксель, Д.В.Харыс і інш.) гал. ўвагу канцэнтраваў на праблеме арган. цэласнасці. Пазней аўстр. біёлаг Л. фон Берталанфі ў сваёй тэорыі эквівалентных сістэм (1930-я г.) дапоўніў канцэпцыю А. палажэннем пра арганізмы як высокаарганізаваныя адкрытыя сістэмы, што знаходзяцца ў стане дынамічнай раўнавагі з асяроддзем. Ідэі А. атрымалі развіццё ў агульнай тэорыі сістэм, у кібернетыцы, тэорыі інфармацыі і інш. *Г.І.Шчарбіцкі.*

**АРГАНІ́ЧНАЕ ВЫВЕ́ТРЫВАННЕ**, гл. *Біялагічнае выветрыванне.*

**АРГАНІ́ЧНАЕ ШКЛО**, гл. *Шкло арганічнае.*

**АРГАНІ́ЧНАЯ АРХІТЭКТУ́РА**, творчы кірунак, у аснове якога ляжыць прынцып падпарадкавання формы архітэктурнага твора яго зместу. Узнікла ў 1-й пал. 20 ст. як рэакцыя супраць *акадэмізму*, *рацыяналізму* і *эклектыкі*. Ідэі А.а. закладзены ў 1890-я г. амер. арх. Л. *Салівенам*, развіты ў тэорыі і практыцы буд-ва яго вучнем Ф.Л.*Райтам*. Канцэпцыі А.а. выходзяць з цеснай сувязі архітэктуры з прыродай, грунтуюцца на бесперапыннасці арх. прасторы, на праектаванні «з сярэдзіны — да навакольнага асяроддзя», рацыянальным выкарыстанні якасцяў буд. матэрыялаў, увядзенні элементаў нар. творчасці; сама функцыя будынка не абмяжоўвалася тэхнал. і фізіял. фактарамі, а ўключала і эстэтычны, таму арх. твор уяўляў сабой цэласны арганізм.

Пад уздзеяннем ідэй А.а. склаліся рэгіянальныя арх. школы ў сканд. краінах (творчасць А. *Аалта* і інш.); у ЗША прынцыпы А.а. выкарыстоўвала т. зв. каліфарнійская школа на чале з Р. *Нейтрай*. У 1940-я г. тэорыя падхоплена ў Італіі арх. Б.Дзэві; у 1945 у Рыме створана група APAO (Associazione per Architettura Organica, Асацыяцыя арганічнай архітэктуры), якая падкрэслівала гуманіст. кірунак асн. палажэнняў А.а. Дыяпазон А.а. быў абмежаваны гал. чынам буд-вам асабнякоў, вілаў, загарадных атэляў; у 1960-я г. А.а. растварылася сярод рацыяналістычных кірункаў архітэктуры. Прынцыпы формаўтварэння, выпрацаваныя А.а., выкарыстоўваюцца ў бел. архітэктуры.

*Літ.*: Райт Ф.Л. Будущее архитектуры: Пер. з англ. М., 1960; Zevi B. Towards an organic architecture. London, 1950.

**АРГАНІ́ЧНАЯ БУДО́ВА КАПІТА́ЛУ**, адносіны паміж вартасцю *пастаяннага капіталу* і вартасцю *пераменнага капіталу*, катэгорыя марксісцкай палітэканоміі. Адлюстроўвае тэхн. склад капіталу: колькасныя адносіны сродкаў вытв-сці да рабочай сілы. Чым больш

Да арт. **Арганічная архітэктура.** Дом над вадаспадам. Арх. Ф.Л. Райт. 1937.

машын, абсталявання, матэрыялаў і інш. сродкаў вытв-сці прыпадае на аднаго рабочага, тым А.б.к. і яго тэхн. будова вышэйшыя. З развіццём вытворчасці, паскарэннем тэмпаў навуковатэхн. прагрэсу гэты паказчык павялічваецца. Гэта азначае, што доля жывой працы змяншаецца, а доля мінулай працы расце, у выніку прадукцыйнасць працы павышаецца.

**АРГАНІ́ЧНАЯ ХІ́МІЯ**, галіна *хіміі*, якая вывучае злучэнні вугляроду з інш. элементамі (*арганічныя злучэнні*) і іх ператварэнні. Займаецца сінтэзам і вызначэннем структуры арган. злучэнняў, вывучэннем сувязі хім. будовы рэчываў з рэакц. здольнасцю і фіз. ўласцівасцямі, практ. выкарыстаннем. Падзяляецца на стэрэахімію, хімію высокамалекулярных злучэнняў, прыродных рэчываў (антыбіётыкаў, вітамінаў, гармонаў і інш.), металаарган., фтораган., комплексных злучэнняў, фарбавальнікаў. Цесна звязана з біяхіміяй, медыцынай, біялогіяй, арган. геахіміяй, малекулярнай біялогіяй і інш. галінамі навук.

З'явілася ў пач. 19 ст. ў выніку абагульнення ведаў пра ўласцівасці рэчываў жывёльнага і раслінага паходжання і ўяўленняў таго часу аб жыццёвай сіле (vis vitalis), якая быццам бы стварае арган. рэчывы толькі ў жывых арганізмах. Тэрмін «А.х.» ўведзены Ё. Берцэліусам (1827). Сінтэз мачавіны (Ф.Вёлер; 1828), аніліну (М.М.Зінін; 1842), воцатнай кіслаты (А.Кольбе; 1845), рэчываў тыпу тлушчаў (П.Бертло; 1854), цукрыстага рэчыва (А.М.Бутлераў; 1861) паказаў магчымасць штучнага атрымання арган. рэчываў. З 2-й чвэрці 19 ст. пачалі развівацца тэарэт. ўяўленні А.х., у т.л. тэорыя радыкалаў (Ю.Лібіх, Вёлер, Э.Франкленд, Р.Бунзен), тэорыя тыпаў (Ж.Дзюма, Ш.Жэрар і О.Ларан), паняцце пра валентнасць хім. элементаў, чатырохвалентнасць вугляроду і здольнасць яго атамаў ствараць складаныя малекулы. Абгрунтаваная ў 1861 Бутлеравым *хімічнай будовы тэорыя* прапанавала існаванне сувязі паміж будовай і ўласцівасцямі арган. злучэнняў, растлумачыла з'яву *прасторавай ізамерыі* арган. злучэнняў. А. Кекуле ў 1865 створана тэорыя будовы араматычных злучэнняў (на прыкладзе бензолу); у 1874 Я.Вант-Гоф і Ж.Ле Бель заклалі асновы *стэрэахіміі*, вылучылі *аптычную ізамерыю* і *геаметрычную ізамерыю* арган. рэчываў. Развіццё А.х. ў пач. 20 ст. звязана з дасягненнямі квантавай фізікі і электронных тэорый хім. сувязі. Вызначаны тыпы хім. сувязі; Г.Льюіс, В.Косель, К.Інгалд, Л.Полінг распрацавалі і дапоўнілі ўяўленнямі квантавай хіміі і квантава-хімічнымі разлікамі электронную тэорыю будовы арган. злучэнняў, прадказалі і растлумачылі іх рэакцыйную здольнасць. У 2-й пал. 20 ст. пачалося станаўленне фізічнай А.х., у якой абагульнены ўяўленні па механізмах рэакцый і сувязі паміж структурай арган. злучэнняў і іх рэакц. здольнасцю; шырокае выкарыстанне ў даследаваннях храматаграфіі, рэнтгенаскапіі, масспектраскапіі, метадаў ЭПР, ЯМР, ІЧ- і УФспектраскапіі. Сінтэзаваны новыя класы крэмнійарган. злучэнняў (полісілаксаны), поліаміды (нейлон), фторпалімеры (тэфлон), цэнавыя злучэнні пераходных металаў (феракцэн), фізіялагічна актыўныя злучэнні, лекавыя прэпараты, атрутныя рэчывы, сродкі аховы раслін, антыпірэны. Метады А.х. разам з фіз. метадамі даследавання выкарыстоўваюцца ў вызначэнні будовы нуклеінавых кіслотаў, бялкоў, складаных прыродных злучэнняў, з дапамогай матэм. мадэлявання ажыццяўляецца мэтанакіраваны сінтэз арган. рэчываў з зададзенымі ўласцівасцямі. Магчымасці А.х. дазволілі сінтэзаваць хларафіл, вітамін $B_{12}$ (Р.Вудварт), полінуклеатыды (А.Тод), распрацаваць аўтаматызаваны сінтэз

ферментаў. Сучаснае дасягненне А.х. ў генай інжынерыі — сінтэз актыўнага гена (Х.Каран; 1976). Выкарыстанне дасягненняў А.х. прывяло да стварэння тэхналогій вытв-сці сінт. каўчукаў, пластычных масаў, сінт. валокнаў, фарбавальнікаў, кінафотаматэрыялаў, атрутных рэчываў, сродкаў аховы раслін, духмяных рэчываў, лек. прэпаратаў.

На Беларусі даследаванні па А.х. пачаліся ў 1924 у БДУ і вядуцца ў ін-тах фізіка-арган. і біярган. хіміі АН, БДУ, Бел. тэхнал. ун-це, с.-г., мед. і інш. НДІ. Сінтэзаваны і вывучаны ператварэнні металаарган., поліхлорарган., пераксідных злучэнняў, ацыклічных і гетэрацыклічных злучэнняў, стэроідаў, гетэрастэроідаў, простагландзінаў, нуклеатыдаў, тэрпеноідаў. Буйнейшыя прадпрыемствы: ВА «Палімір» (г. Наваполацк), ВА «Азот» (г. Гродна), Магілёўскі камбінат сінт. валокнаў.

*Літ.*: Несмеянов А.Н., Несмеянов Н.А. Начала органической химии. Кн. 1—2. 2 изд. М., 1974; Нейланд О.Я. Органическая химия. М., 1990. *К.Л.Майсяйчук.*

**АРГАНІ́ЧНАЯ ШКО́ЛА** ў сацыялогіі, кірунак у зах. сацыялогіі ў канцы 19 — пач. 20 ст., звязаны са спробамі тэарэт. абгрунтаваць сутнасць і развіццё грамадства на аснове аналогіі з прыродай жывога арганізма. Абапіраючыся на дасягненні біялогіі (клетачнай будовы арганізмаў і эвалюцыйнай тэорыі Дарвіна), імкнулася, каб сацыялогія заняла прамежкавае месца паміж прыродай чалавека і чалавечым грамадствам. Асобныя прынцыпы такой тэорыі вядомы яшчэ ў сац.-філас. канцэпцыях Платона, Арыстоцеля, Гобса, Мантэск'е і інш. У поглядах Кона і Спенсера ідэя біял. рэдукцыянізму набыла больш выразны сацыялагічны характар. Класічныя прадстаўнікі школы А. Шэфле (Германія), Р.Вормс і А.Эспінас (Францыя), П.Ліліенфельд (Расія) сцвярджалі, што грамадства і ёсць арганізм, атаясамліваючы чалавека з клеткай, сац. інстытуты з яго органамі (напр., урад з галаўным мозгам, трансп. зносіны з кровазваротам, сувязь з нерв. сістэмай і г.д.). Сац. канфлікты яны зводзілі да хвароб, а іх прафілактыку і лячэнне звязвалі з «сацыяльнай гігіенай». Падобныя аналогіі стваралі бачнасць тэарэт. вырашэння сац. праблем, але не давалі адказаў на шматлікія пытанні, з якімі сутыкаліся і навукоўцы, і практыкі (палітыкі, эканамісты, кіраўнікі і г.д.). Таму да пач. 20 ст. ідэі А.ш. саступілі месца больш строгім тэарэт. канцэпцыям, якія арыентуюцца на вывучэнне грамадства як больш складанай і самаст. сістэмы.

*Літ.*: Вормс Р. Биологические принципы в социальной эволюции: Пер. с фр. Киев, 1912; История социологии. Мн., 1993. *Е.М.Елсукоў.*

**АРГАНІ́ЧНЫ СТАТУ́Т КАРАЛЁЎСТВА ПО́ЛЬСКАГА 1832** («Органический статут»), прававы акт, уведзены рас. ўладамі пасля задушэння паўстання 1830—31 у Каралеўстве Польскім замест скасаванай канстытуцыі 1815. Выдадзены 26.2.1832 у Пецярбургу царом Мікалаем I. Паводле статута тэр. Каралеўства ўключалася ў склад Рас. імперыі, скасоўваліся асобны акт каранацыі цара ў Варшаве, сейм і частка ўрадавых камісій, польск. армія, але захоўваліся аўтаномныя польскія ўстановы (намесніцтва, адм. і дзярж. саветы і інш.), польск. мова ва ўстановах і ў школах і інш. Дэкларацыяныя статутам элементы польск. аўтаноміі па меры ўвядзення ў Каралеўстве адм. нормаў Рас. імперыі былі ліквідаваны (напр., Дзярж. савет у 1841).

**АРГАНІ́ЧНЫЯ ЗЛУЧЭ́ННІ**, вуглевадародныя злучэнні і іх вытворныя. Падзяляюцца на *ацыклічныя злучэнні*, карбацыклічныя (гл. *Аліцыклічныя злучэнні*, *Араматычныя злучэнні*) і *гетэрацыклічныя злучэнні*. Уласцівасці А.з. вызначаюцца прыродай замяшчальнікаў у вугляродным ланцугу ці цыкле, функцыянальных груп і наяўнасцю кратных сувязяў.

Аргентыт.

А.з., якія адрозніваюцца колькасцю $CH_2$-груп, утвараюць гамалагічныя шэрагі, напр. метан ($CH_4$), этан ($C_2H_6$), прапан ($C_3H_8$) і інш.; злучэнні з аднолькавым лікам атамаў вугляроду, але з рознымі функцыян. групамі — генетычныя шэрагі, напр. этан ($C_2H_6$), этылхларыд ($C_2H_5Cl$), этанол ($C_2H_5OH$), ацэтальдэгід ($CH_3CHO$), воцатная к-та ($CH_3COOH$) і інш. Паводле характару элементаў, якія ўтвараюць сувязь з атамам вугляроду, адрозніваюць галаген-, кіслародсера- і азотзмяшчальныя вытворныя вуглевадародаў, шэраг *элементаарганічных злучэнняў*, у т.л. *металаарганічных злучэнняў*. А.з. даследуюцца *арганічнай хіміяй*.

**АРГАНІ́ЧНЫЯ ЎГНАЁННІ**, *угнаенні*, у якіх ёсць пажыўныя для раслін хім. элементы пераважна ў форме арган. злучэнняў расліннага ці жывёльнага паходжання. Да А.у. адносяцца гной, гнойная жыжка і птушыны памёт, таксама кампосты (сумесі на аснове гною з торфам, фасфатнай мукой), торф, глей (сапрапель), зялёныя ўгнаенні, сцёкавыя воды і інш. адходы прам-сці і камунальнай гаспадаркі. Забяспечваюць расліны азотам, фосфарам, каліем, неабходнымі мікраэлементамі, паляпшаюць фіз. і фіз.-хім. ўласцівасці глебы, яе водны і паветраны рэжым, змяншаюць шкоднае ўздзеянне кіслотнасці на расліны, актывуюць жыццядзейнасць азотфіксавальных *бактэрый*. Перапрэлы гной (пры вільготнасці 75%) мае (у %): азоту (N) 0,5, фосфару ($P_2O_5$) 0,25, калію ($K_2O$) 0,6, кальцыю (CaO) 0,7; курыны памёт (пры вільготнасці 56%) 2,2; 1,8; 1,1; 2,4 адпаведна. Калій і натрый у А.у. больш засваяльныя, чым у *мінеральных угнаеннях*. Праз А.ў. ажыццяўляецца кругаварот пажыўных рэчываў: глеба — расліны — жывёла — расліны — глеба.

**АРГАНО́ІДЫ** (ад грэч. organon прылада, інструмент + eidos від), пастаянныя спецыялізаваныя цытаплазматычныя структуры жывёльнай ці раслінай клеткі, што выконваюць пэўную функцыю. Да іх адносяцца мітахондрыі, комплекс Гольджы, рыбасомы, эндаплазматычная сетка, клетачны цэнтр, мікратрубачкі, філаменты, лізасомы і інш., у раслінных клетках — пластыды. Спецыяльныя А. — цытаплазматычныя структуры, што выконваюць спецыфічную функцыю пэўнага тыпу клетак (міяфібрылы, тонафібрылы, базафільнае рэчыва нейрона). Іх часта наз. *арганеламі*.

**А́РГАС**, Аргус, у грэчаскай міфалогіі велікан, сын *Геі*. Цела А. пакрыта мноствам вачэй (паводле інш. міфаў, 100 ці 4 вокі), прычым спалі адначасова толькі 2. *Гера* даручыла А. пільнаваць каханку *Зеўса* Іо, якую ператварыла ў карову. Паводле загаду Зеўса А. быў забіты *Гермесам*.

**А́РГАС** (Argos), горад у Грэцыі на п-ве Пелапанес. Засн. ў пач. 2-га тыс. да н.э. У 15—14 ст. да н.э. адзін з цэнтраў ахейскага аб'яднання. Пасля захопу яго ў 12—11 ст. да н.э. дарыйцамі гал. сапернік Спарты. Дасягнуў росквіту ў час праўлення тырана Федона (7 ст. да н.э.), які першы ў Грэцыі пачаў чаканіць сярэбраную манету. У час грэка-персідскіх войнаў 500—449 да н.э. захоўваў нейтралітэт. У 4 ст. да н.э. трапіў у залежнасць ад Македоніі. У 229 да н.э. ўвайшоў у *Ахейскі саюз*. З 146 да н.э. пад уладай Рыма. У 297 і 395 н.э. разбураны готамі. У ант. часы з мастацкай школы А. выйшлі грэч. скульптары Агелад, Паліклет, Палімед. Археал. раскопкі вядуцца з 1902.

**АРГАТЫ́ЗМ** (франц. argotisma), умоўнае або штучнае слова, якое выкарыстоўваецца ў мове замест агульнавядомага. А. маюць вузкаспец. характар і знаходзяцца па-за межамі літ. мовы: напр., «філон» — гультай, «стукач» — даносчык, «хіляць» — ісці, «хвост» — акадэмічная запазычанасць і інш. Эмацыянальна-экспрэсіўная афарбоўка, выразнае адценне зніжанасці або грубаватасці, уласцівае А., дазваляе карыстацца імі ў маст. творах для стварэння каларыту адпаведнага сац. асяроддзя, вобраза ці своеасаблівага камічнага эфекту. *І.Л.Бурак.*

**АРГЕ́ДАС** (Arguedas) Хасе Марыя (18.1.1911, г. Андаўайлас, Перу — 2.12.1969), перуанскі пісьменнік, прадстаўнік т. зв. індыянісцкага кірунку ў л-ры Лац. Амерыкі. Аўтар зб. апавяданняў «Вада» (1935), аповесці «Свята Явар» (1941), раманаў «Брыльянты і крамяні» (1954), «Глыбокія рэкі» (1958), «Кроў усіх расаў» (1964), «Ліса ўнізе, ліса ўверсе» (1971), у якіх адлюстраваў жыццё індзейцаў і метысаў. Імкнуўся вырашыць праблему пераадолення іспана-індзейскага культурнага дуалізму ў працэсе фарміравання нац. культуры, карані якой бачыў у стараж. традыцыях карэннага насельніцтва.

*Тв.*: Los ríos profundos. La Habana, 1965.

**АРГЕ́ЗІ** [Arghezi; сапр. Іон Тэадарэску (Teodorescu)] Тудор (21.5.1880, г. Бухарэст — 14.7.1967), румынскі пісьменнік. Акадэмік Румынскай АН (з 1955). За антыўрадавыя памфлеты ў 1930-я г. зняволены, за выступленні супраць фашызму ў 1943 кінуты ў канцлагер. Аўтар зб-каў лірыкі «Патрэбныя словы» (1927), «Сем песень з закрытым ротам» (1939), «Новыя вершы» (1963), «Ноч» (1967), раманаў «Вочы Божай маці» (1934), «Могілкі Дабравешчання» (1936) і інш. Пісаў таксама сатыр. прозу, нарысы, эсэ, апавяданні для дзяцей. Паэт-гуманіст, схільны да філас. абагульненняў. Рэфарматар рум. верша. На бел. мову вершы А. перакладалі А.Бачыла і П.Прыходзька.

*Тв.*: Рус. пер. — Избранное. М., 1984.

**АРГЕНТЫ́Т** (ад лац. argentum серабро), сярэбраны бляск, мінерал класа сульфідаў, кубічная паліморфная мадыфікацыя $Ag_2S$. Прымесі медзі, свінцу, жалеза і інш. Утварае масіўныя агрэгаты, плёнкі, пражылкі, украпанні. Колер свінцова-шэры да чорнага. Бляск металічны. Цв. 2—2,5. Шчыльн. 7,3 г/см$^3$. Трапляецца ў нізкатэмпературных гідратэрмальных радовішчах сярэбраных рудаў. У прыродзе рэдкі, назва «А.» часта выкарыстоўваецца да псеўдамарфозаў *акантыту* па аргентыце.

**АРГЕНЦІ́НА** (Argentina), Аргенцінская Рэспубліка (República Argentina), дзяржава ў Паўд. Амерыцы. Абмываецца водамі Атлантычнага ак. Займае паўд.-ўсх. ч. мацерыка, усх. палову в-ва Вогненная Зямля і суседнія з ёй астравы. Мяжуе на З з Чылі, на Пн з Балівіяй і Парагваем, на ПнУ з Бразіліяй і Уругваем. Падзяляецца на 22 правінцыі, адну федэральную (сталічную) акругу і нац. тэрыторыю Вогненная Зямля; Фалклендскія, або Мальвінскія, а-вы — спрэчная з Вялікабрытаніяй тэрыторыя. Пл. 2,8 млн. км$^2$ (8-я па велічыні краіна свету), нас. 33,9 млн. чал. (1994). Сталіца — г. *Буэнас-Айрэс*. Афіц. мова іспанская, пашыраны італьян., ням., французская, англ. Нац. святы — гадавіна Майскай рэвалюцыі (25 мая), Дзень незалежнасці (9 ліп.).

**Дзяржаўны лад**. А. — федэратыўная рэспубліка. Дзейнічае канстытуцыя 1853 (са зменамі). Кіраўнік дзяржавы і ўрада — прэзідэнт, які выбіраецца на 6 гадоў. Вышэйшы заканадаўчы орган — Нац. кангрэс, які складаецца з сената (46 чал.) і палаты дэпутатаў (254 чл.).

**Прырода**. Тэр. А. выцягнута з Пн на Пд на 3700 км (ад 22° да 55° паўд. ш.), з З на У да 1577 км. Берагі слаба парэзаны залівамі Ла-Плата, Эль-Рынкон, Сан-Матыяс, Сан-Хорхе, Баія-Грандэ і інш. У рэльефе вылучаюцца раўніны і нізіны: на Пн і У Гран-Чака, Пампа, Аргенцінскае Міжрэчча; у цэнтр. ч. Ла-Плацкая нізіна; на Пд Патагонскае пласкагор'е (да 2000 м) з плоскімі сталападобнымі паверхнямі — мясетамі; на З Анды з найвыш. пунктам Паўд. Амерыкі гарой Аканкагуа (6960 м), на ПнЗ заходзіць ч. высакагорнага плато Пуна з шматлікімі вулканамі, на ПнУ — Бразільскае пласкагор'е. Клімат раўніннай ч. трапічны і субтрапічны, на Пд — умераны. Сярэднія т-ры самага цёплага месяца (студз.) на Пн 28 °С, на Пд 10 °С, самага халоднага (ліп.) адпаведна 18 °С і 1 °С. У гарах клімат умерана халодны. Ападкаў за год ад 100—300 мм у Патагоніі да 1400—1600 мм на ПнУ, на ўсх. схілах Андаў да 5000 мм. Рачная сетка найб. развітая ў нізіннай і вільготнай паўн.-ўсх. ч. краіны. Буйныя паўнаводныя і суднаходныя ў нізоўях рэкі Парана (з прытокам Парагвай) і Уругвай зліваюцца ў агульнае вусце — эстуарый Ла-Плата. Да іх басейна належаць рэкі Пількамайо, Рыо-Бермеха, Рыо-Салада. Рэкі Патагоніі (Рыо-Каларада, Рыо-Негра, Чубут з Рыо-Чыко і інш.) багатыя гідраэнергарэсурсамі. Каля падножжа Андаў шматлікія, пераважна ледавіковыя, азёры Наўэль-Уапі, Буэнас-Айрэс, В'едма, Лага-Архенціна, Фаньена (на Вогненнай Зямлі). Каля 20% тэр. А. пад вечназялёнымі і лістападнымі лясамі, пераважна ў гарах. На Гран-Чака сухое рэдкалессе на чырвоных глебах, ва Усх. Пампе лугавыя стэпы на чарназёмах (разараныя), у Патагоніі паўпустыні. У фауне шмат відаў, якія невядомы ў краінах Старога Свету: браняносцы, скунсы, магеланаў сабака, пампаскі кот і інш. Шмат птушак і паўзуноў. Найб. нац. паркі: Ігуасу, Лос-Гласьярэс, Ланін, Лос-Алерсес, Наўэль-Уапі і інш.

**Насельніцтва**. Больш за 90% насельніцтва — *аргенцінцы*, нашчадкі эмігрантаў з Іспаніі, Італіі, Францыі і інш. краін Еўропы. Жывуць таксама італьянцы, украінцы, беларусы, іспанцы, палякі, немцы, яўрэі і інш. Карэнных жыхароў — індзейцаў — засталося каля 100 тыс. чал.; кечуа, тупі-гуарані і інш. Жывуць каля мяжы з Балівіяй і Парагваем, араўканы, тэхуэльча (патагонцы) — у Патагоніі. Метысаў, што гавораць на мове кечуа, каля 200 тыс. чал. Большасць вернікаў — католікі. Сярэдняя шчыльн. насельніцтва 12,1 чал. на 1 км$^2$ (1994). Большасць сканцэнтра-

Герб і сцяг Аргенціны.

вана ў Пампе, менш населеная тэр. на Пд А. Гар. насельніцтва 86%, трэцяя частка яго ў Вял. Буэнас-Айрэсе. Іншыя вял. гарады: Кордава, Мендоса, Расарыо, Ла-Плата, Марон, Мар-дэль-Плата, Тукуман, Санта-Фэ.

**Ахова здароўя**. Сярэдняя працягласць жыцця ў мужчын 66, у жанчын 73 гады. Узровень нараджальнасці 21 на 1 тыс. чал. Дзіцячая смяротнасць 25,6 дзяцей на 1 тыс. нованароджаных (1994).

**Гісторыя**. Тэр. А. заселена чалавекам у 8—7-м тыс. да н.э. Напярэдадні еўрап. заваявання яе насялялі шматлікія індзейскія плямёны, якія знаходзіліся на розных ступенях першабытнага ладу. На ПнЗ жылі дыягіты (кальчакі), што вялі аселы лад жыцця, займаліся земляробствам, будавалі ірыгацыйныя сістэмы, ведалі ткацтва, апрацоўвалі золата і серабро. На ПнУ і ў цэнтры А. жылі паляўнічыя плямёны. Пазней сюды прыйшлі гуарані, чыёй мовай да гэтага часу карыстаецца сельскае насельніцтва А. На тэр. сучасных правінцый Буэнас-Айрэс і Мендоса жылі плямёны пампа; з Паўн. Патагоніі сюды прыходзілі для менавага гандлю качавыя плямёны араўканаў. У 16 ст. тэр. А. каланізавалі іспанцы. Новыя землі яны назвалі Ла-Плата і ўключылі іх у віцэ-каралеўства Перу. У 1536 канкістадор Педра Мендоса заснаваў пасёлак Пуэрта Санта Марыя дэ Буэнас-Айрэс — будучую сталіцу краіны. У 1617 на тэр. А. і Уругвая ўтворана губернатарства Ла-Плата. У 1776 б.ч. А., Парагвая і Верхняга Перу аб'яднаны ў віцэ-каралеўства Рыа-дэ-ла-Плата. Аселыя на гэтых землях іісп. каланісты (пераважна андалузцы і баскі) асімілявалі мясц. індзейскае насельніцтва, утварыўшы паўд.-амер. тып метысаў. Нашчадкаў іісп. каланістаў і дзяцей ад змешаных шлюбаў са светлай скурай сталі называць крэоламі. Іісп. заваяванне перапыніла самаст. развіццё індзейскіх плямёнаў. Жорсткая іх эксплуатацыя ў рудніках, адцясненне ў больш халодныя раёны і перадгор'і Андаў рэзка зменшылі колькасць мясц. насельніцтва. У абарону яго выступіла каталіцкая царква. У 1610 ордэн езуітаў стварыў для індзейцаў А., Парагвая і Уругвая 30 пасяленняў-рэдукцый, дзе яны займаліся земляробствам, знаёміліся з еўрап. культурай. У 17 ст. ў сувязі з недахопам рабочых рук іспанцы пачалі завозіць неграў-рабоў з Афрыкі. Палітыка каланізатараў неаднойчы выклікала нар. хваляванні (1580, 1630, 1657, 1712, 1720, 1770). Шматлікія абмежаванні, якімі метраполія тармазіла сац.-эканам. развіццё Ла-Платы, выклікалі супраціўленне крэолаў. Вайна паўн.-амер. калоній за незалежнасць, франц. рэвалюцыя канца 18 ст., буйныя паўстанні індзейцаў Перу і Чылі стымулявалі вызв. барацьбу і ў А. Крызіс іісп. калан. сістэмы спрабавала выкарыстаць Вялікабрытанія. Аднак 2 яе інтэрвенцыі ў 1806—07 пацярпелі паражэнне. У выніку антыісп. паўстання 1810 у Буэнас-Айрэсе скінуты віцэ-кароль і ўлада перайшла да Патрыят. т-ва, якое сфарміравала часовы ўрад Ла-Платы. Гэта паўстанне стала састаўной ч. *Вайны за незалежнасць іспанскіх калоній у Амерыцы 1810—26.* 9.7.1816 Нац. кангрэс у Тукумане абвясціў незалежнасць Аб'яднаных правінцый Ла-Платы, у 1826 яны пераўтвораны ў Федэратыўную Рэспубліку А. Першым прэзідэнтам А. стаў Б. *Рывадавія*. У 1829 у А. ўстаноўлены дыктатарскі рэжым Х.М.Росаса, які ў выніку нар. руху ў 1858 быў скінуты. Канстытуцыя 1853 паскорыла працэс аб'яднання краіны. Прагрэсіўна-ліберальныя ўрады Д. Сарам'ента (1868—74), Н.Авельянеды (1874—80) правялі шэраг рэформаў. Паступова А. стала буйным экспарцёрам збожжа. Да пач. 20 ст. ў асн. склалася аргенцінская нацыя. Выразнікам патрабаванняў далейшых пераўтварэнняў стала партыя Грамадз. радыкальны саюз (ГРС), створаная ў 1891. У 1916 яна перамагла на прэзідэнцкіх выбарах і яе ўрады, што кіравалі краінай да 1930, ажыццявілі шэраг рэформаў, нацыяналізавалі нафтавую прам-сць, умацавалі дзярж. сектар, увялі 8-гадзінны рабочы дзень. З 1930 да 1946 краінай правілі ваен. рэжымы. На прэзідэнцкіх выбарах 1946 перамог лідэр хустысіялісцкага руху (гл. *Хустысіялізм*) Х.Д. *Перон*, які правёў новыя рэформы. У выніку ваен. перавароту ў вер. 1955 Перон скінуты, і да 1983 А. правілі пераважна ўрады ваенных. Гады праўлення апошняга ваен. рэжыму пазначаны абвастрэннем унутр. і знешняга становішча, што найб. выявілася ў *англа-аргенцінскім канфлікце 1982* за Фалклендскія (Мальвінскія) а-вы. У выніку выбараў 1983 прэзідэнтам А. стаў Р. *Альфансін* ад партыі ГРС. Пагаршэнне эканам. сітуацыі ў краіне вылілася ў сац. хваляванні. На выбарах 1989 перамог кандыдат ад Хустысіялісцкай партыі К. Менем. Ён аднавіў дыпламат. адносіны з Вялікабрытаніяй, умацаваў сувязі з дзяржавамі ЕЭС; А. выйшла з Руху недалучэння і арыентуецца на пазіцыю ЗША і інш. развітых краін. У 1991 падпісана пагадненне з Бразіліяй, Парагваем і Уругваем пра ўтварэнне паўд.-амер. агульнага рынку. На выбарах у 1995 прэзідэнтам краіны зноў выбраны К.Менем. А. — адна з краін-заснавальніц ААН, чл. Арг-цыі амер. дзяржаў, Лацінаамерыканскай асацыяцыі інтэграцыі і інш. Дыпламат. адносіны з Рэспублікай Беларусь устаноўлены 6.11.1992.

Аргенціна. Статак авечак у Патагоніі. Правінцыя Санта-Крус.



Аргенціна. Пейзаж аргенцінскай Пуны.

Аргенціна. Нацыянальны парк Наўэль-Уапі.

**Палітычныя партыі і прафсаюзы**. Хустысіялісцкая партыя, Грамадз. радыкальны саюз, Саюз дэмакр. цэнтра, Хрысц.-дэмакр. партыя. Адзіны праф. цэнтр краіны — Усеагульная канфедэрацыя працы.

**Гаспадарка**. А. — адна з найб. развітых у эканам. адносінах краін Лац. Амерыкі. Валодае разнастайнымі прыродна-эканам. рэсурсамі, урадлівымі землямі, энерганосьбітамі (нафта, газ, гідраэнергія, найб. ў Лац. Амерыцы запасы уранавых рудаў) і інш. Валавы ўнутр. прадукт (ВУП) складае 112 млрд. дол. (1992), 3,4 тыс. дол. на душу насельніцтва, што прыкладна ўдвая перавышае сярэдні ўзровень па рэгіёне. Прамысловасць. Аснова эканомікі — высокаразвітая апрацоўчая прам-сць, дае каля 24% ВУП і амаль цалкам забяспечвае патрэбы краіны. Каля 50% кошту прамысл. прадукцыі дае чорная металургія (выплаўка чыгуну і сталі, пераважна на прывазной сыравіне), каляровая металургія (выплаўка свінцу, цынку, алюмінію), маш.-буд. (аўта-, трактара-, судна- і станкабудаванне, с.-г. машыны), нафтаперапр., нафтахім. і хім. прам-сць. Развіта вытворчасць трубаў, электратэхн., цэлюлозна-папяровая, цэментная прам-сць. У А. раней, чым у інш. краінах Лац. Амерыкі, узніклі галіны, звязаныя з высокімі тэхналогіямі (электронная, атамная). Удзельная вага традыц. галін прам-сці — харчасмакавай (тытунёвая, вытв-сць парагвайскага чаю матэ) і тэкстыльнай — знізілася. Вельмі развіта харч. прам-сць (мясная, цукровая, маслабойная, кансервавая, мукамольная, вінаробчая і інш.). Значная гарбарна-абутковая прам-сць. У горназдабыўной прам-сці вылучаецца здабыча нафты і прыроднага газу, поліметалічных, уранавых, жалезных, марганцавых, медных, берыліевых і вальфрамавых рудаў, а таксама вугалю. У 1992 выпрацавана 51,4 млрд. кВт.гадз электраэнергіі (каля 48% на ЦЭС, 46% на ГЭС, 5% на АЭС). Буйныя прамысл. цэнтры: Буэнас-Айрэс (каля паловы прамысл. прадукцыі), Кордава, Ла-Плата, Расарыо, Санта-Фэ, Мендоса, Баія-Бланка, Сарата і інш.

Сельская гаспадарка. Разам з рыбалоўствам дае 15% ВУП і за-

бяспечвае краіну харч. прадуктамі і большай ч. сыравіны. Спецыялізацыя — таварная вытв-сць мяса і збожжа. Каля 75% зямельнага фонду належыць буйным латыфундыям (больш за 1000 га). Плошча с.-г. угоддзяў каля 180 млн. га, з іх 20% — ворныя землі. Асн. галіна — жывёлагадоўля: буйн. раг. жывёла мясного кірунку і мяса-воўнавая авечкагадоўля. Развіта птушкагадоўля. Земляробства канцэнтруецца ў Пампе. Асн. с.-г. культуры: пшаніца, кукуруза, ячмень, авёс, сланечнік. Вырошчваюць лён, жыта, цукр. трыснёг, цукр. буракі, сою, рыс, чай, бавоўнік, люцэрну, бульбу, тытунь, арахіс, вінаград, аліўкавыя і тунгавыя дрэвы, цытрусавыя. Вакол вял. гарадоў — агародніцтва, садаводства, малочная жывёлагадоўля і свінагадоўля.

Транспарт. У знешніх перавозках гал. роля належыць марскому транспарту, ва ўнутраных — аўтамабільнаму. Найб. марскія парты: Буэнас-Айрэс, Ла-Плата, Расарыо, Баія-Бланка, Сан-Нікалас, Камадора-Рывадавія, Санта-Фэ, Мар-дэль-Плата. Даўж. аўтадарог 575 тыс. км, 55 тыс. км асфальтаваныя, чыгунак 37 тыс. км. У А. 10 міжнар. аэрапортаў, найбольшы ў Буэнас-Айрэсе. Каля 80% экспарту складае с.-г. прадукцыя: мяса, мясапрадукты, воўна, скуры, збожжа, маслічныя, малочныя прадукты, дубільны экстракт з кебрача, чай. Экспартуюць таксама абсталяванне, вальфрам. Імпарт: машыны, прамысл. абсталяванне, сыравіна, нафтапрадукты, паліва. Гандл. партнёры: ЗША, Бразілія, Балівія, Германія, Італія, Японія, Нідэрланды і інш. Беларусь у 1993 экспартавала ў А. грузавыя аўтамабілі, трактары, з А. прывозіла с.-г. прадукты. Грашовая адзінка — песа.

**Узброеныя сілы** А. ўключаюць рэгулярныя ўзбр. сілы і ваенізаваныя фарміраванні. Рэгулярныя ўзбр. сілы налічваюць 83 тыс. чал. (1991) і складаюцца з сухап. войскаў, ВПС і ВМС. Вярх. галоўнакамандуючы — прэзідэнт. Сухап. войскі (45 тыс. чал.) зведзены ў 4 армейскія корпусы, маюць на ўзбраенні танкі і інш. бранятэхніку, артылерыю, ракеты і інш. У складзе ВПС (13 тыс. чал.) 10 авіяц. брыгад (143 баявыя, 164 дапаможныя самалёты, 45 верталётаў). ВМС (25 тыс. чал.) уключаюць флот, авіяцыю ВМС і падраздзяленне марской пяхоты (3 тыс. чал.); 36 баявых караблёў (1 авіяносец, 6 эсмінцаў, 7 фрэгатаў, 4 падводныя лодкі, 12 патрульных караблёў і 6 тральшчыкаў), 67 катэраў, 38 дапаможных суднаў, 33 самалёты і 24 верталёты марской авіяцыі. Камплектуюцца ўзбр. сілы паводле закону аб усеагульнай воінскай павіннасці, прызыўны ўзрост — 18 гадоў, тэрмін абавязковай ваен. службы ў сухапутных войсках і ВПС — 1 год, у ВМС — 14 месяцаў. Афіцэрскія кадры рыхтуюць у акадэміях, ваен. вучылішчах, а таксама за мяжой. Ваенізаваныя фарміраванні складаюцца з жандармерыі (ваен. паліцыя, 13 тыс. чал.) і берагавой аховы (9 тыс. чал.). Агульная колькасць рэзерву — 377 тыс. чал. (1987).

**Асвета, навуковыя ўстановы.** Паводле закону аб адукацыі 1976 сістэма адукацыі ў А. ўключае ўстановы дашкольнага выхавання для дзяцей 3—5 гадоў, абавязковую (пачатковую) школу (7 гадоў навучання) для дзяцей 6—12 гадоў, сярэднюю (5—7 гадоў навучання) з двума цыкламі: 3-гадовым базавым (8—10 кл.) і 2—4-гадовым агульнаадук. або спец. навучаннем (у залежнасці ад тыпу сярэдняй навуч. установы ці ВНУ). У 1989/90 навуч. г. дашкольныя дзіцячыя ўстановы (існуюць пры пач. школах) наведвала 720 тыс. дзяцей, у пач. школах займаліся 4,9 млн. вучняў, працавалі 252 тыс. настаўнікаў, у сярэдніх — каля 2 млн. вучняў і 262 тыс. выкладчыкаў. Вышэйшую адукацыю ў А. даюць у асноўным ун-ты (больш за 50), а таксама ін-ты і вышэйшыя каледжы. Каля паловы прыватных ВНУ кантралюе каталіцкая царква. У 1989/90 навуч. г. ў ВНУ займалася каля 903 тыс. студэнтаў, працавала каля 70 тыс. выкладчыкаў. Найбольшыя ун-ты: у Буэнас-Айрэсе (з 1821), Кордаве (з 1613), Ла-Плаце (з 1884), Санта-Фэ (з 1919), Мароне (з 1960) і інш. Найбольшыя б-кі: Нац. б-ка (з 1810), б-ка ун-та ў Буэнас-Айрэсе, Нац. канграса (з 1859). Музеі: прыродазнаўчых навук (з 1823), Нац. гістарычны (з 1889), Нац. музей прыгожых мастацтваў (з 1895), школьны імя Сарм'ента (з 1910, усе ў Буэнас-Айрэсе), прыродазнаўча-гістарычны ў Мендосе (з 1911) і інш. Навуковыя даследаванні вядуцца ў галіновых акадэміях навук, НДІ пры ун-тах і ін-тах, у навук. т-вах.

**Друк, радыё, тэлебачанне.** У А. выходзіць 227 перыяд. выданняў агульным тыражом 2,75 млн. экз. (1990). Найбуйнейшыя газетныя выданні: «Clarín» («Гарніст», з 1945), «Стопіса» («Хроніка», з 1963). Агенцтвы друку: Тэленатысіёса Амерыкана (з 1945), Дзыстрыбуідора Аргенціна дэ Натыскас (прыватнае інфарм. агенцтва, з 1964), Дыярыас і Натысіяс (з 1982). Дзейнічаюць 37 дзярж., 3 прыватныя і 72 мясц. радыёстанцыі. Галоўныя: Радыё Эль Мунда, Радыё дэль Плата, Радыё Насьёналь. 14 дзярж. тэлестанцый, 28 прыватных тэлеканалаў.

**Літаратура.** Літ. помнікі карэннага індзейскага насельніцтва А. не захаваліся. Творы калан. перыяду (пач. 16 — пач. 19 ст.) — гіст. хронікі Р. Дыяса дэ Гусмана, М. дэль Барка Сентынеры (л-ры Ла-Платы). У гады нац.-вызв. руху (1810—16) панаваў рэв.-патрыят. класіцызм (Х. Крус Варэла, Б. дэ Мантэагуда). Пасля абвяшчэння незалежнасці А. ідэйна-маст. кірункам у л-ры стаў рамантызм (Х.М. Гуцьерэс, Э.Эчыверыя, Х.Мармаль). Маст.-філас. твор «Факунда» (1845) Д.Ф.Сарм'ента лічыцца шэдэўрам арг. рамант. школы. Гіст. раман «Амалія» (1855) Х.Мармаля — першы нац. раман. Да канца 18 ст. склаліся традыцыі фальклору гаўча (жыхароў Пампы). На іх аснове развіваецца ўласнаарг. «л-ра гаўча» (І.Аскасубі, Э. дэль Кампа, Р. Аблігада). Яе вяршыня — эпічная паэма Х. Эрнандаса «Марцін Ф'ера» (ч. 1—2, 1872—79), адметная рысамі кастумбрызму (апісанне побыту і нораваў). Імкненне да рэаліст. адлюстравання рэчаіснасці характэрна для твораў прадстаўнікоў кастумбрысцкай л-ры (2-я пал. 19 ст.) Л.В.Лопеса, Л.Кане, Э.Вільдэ, К.Гіда-і-Спана. З пач. 20 ст. ўзмацніліся пазіцыі рэалізму [Х.Мартэль, Э.Камбасерас, Ф.Моча (Х.С.Альварэс), Р.Х.Пайра, Ф.Санчэс, Б.Лінч, М.Гальвес], мадэрнізму і постмадэрнізму (Л.Лугонес, Э.Лаэрта, Б.Фернандэс Марэна, Э.Карыега, А.Сторні, Э.Банчс, Р.А.Арыета, Э.Марцінес Эстрада і інш.). Вялікі ўплыў на развіццё літ. жыцця 1920-х г. зрабілі літ. аб'яднанні «Фларыда» (адстойвала «чыстае» мастацтва: Х.Л.*Борхес*, Э.Мальеа, Л.Марычаль) і «Баэда» (выступала за «мастацтва для жыцця»: А.Юнке, Р.Арльт, Р.Гансалес Туньён). У апошнія дзесяцігоддзі ўклад у развіццё арг. і сусв. л-ры зрабілі Х.Картасар, Х.Л.Борхес, Э.Сабата і інш.

**Архітэктура.** У калан. перыяд архітэктура развівалася ў гарадах, што ўзніклі

**Аргенціна.** Горад Кордава.

на шляхах пранікнення ў краіну іспанцаў. Выраслі гарады Буэнас-Айрэс, Кордава, Санта-Фэ і інш. з прамавугольнай сеткай вуліц, на гал. плошчы якіх узводзіліся сабор, ратуша, палац губернатара, арсенал. Архітэктура 17 ст. вызначалася прастатой і манументальнасцю (арх. Х.Краус, А.Бланкі, Х.Б.Прымалі). Найб. характэрны помнік гэтага перыяду царква Кампанья ў Кордаве (праект інж. Ф.Лемера, 1649—90). З 18 ст. панавалі барока і класіцызм (царква Сан-Ігнасіо ў правінцыі Місьёнес), у канцы 19 — пач. 20 ст. — эклектызм і стылізацыя. У 1920-я г. склаліся рацыяналістычныя тэндэнцыі (арх. А.Вірасора, В.Акоста, Х.Віванка, А.Банет, А.Вільямс). З 1940—50-х г. архітэктары звяртаюцца да арган. архітэктуры, развітых прасторавых і структурных кампазіцый, выкарыстання новых канструкцый і матэрыялаў (А.Агасціні, Х.Сальсон, К.Тэст, А.Гайда, Э.Лестан, Э.Амбаш і інш.).

**Выяўленчае мастацтва**. Да каланізацыі А. ў 16 ст. было развіта мастацтва карэннага насельніцтва — індзейцаў (ткацтва, кераміка, культавая скульптура з каменю, дрэва і гліны, ювелірныя вырабы). У каланіяльны перыяд выяўл. мастацтва ў асн. было рэлігійнае (разнымі дэкар. скульптурамі ўпрыгожвалі алтары-рэтабла, кафедры); развіваўся і свецкі жывапіс (гал. чынам партрэт). Пасля вызвалення А. ад ісп. панавання (1816) пад уздзеяннем заходнееўрап. мастацтва сталі развівацца жывапіс, скульптура, графіка (літограф-жанрыст К.Марэль, пейзажыст П.Пуэйрэдон, скульптар Л.Карэа Маралес, жывапісец-рэаліст Э.Сіворы). На пач. 20 ст. распаўсюдзіўся імпрэсіянізм (жывапісцы Х.Бутлер, П.Куіда, М.Мальяра, П.Сонса Брыяна, Ф.Фадэр, скульптары Р.Іруртыя і інш.). У 1929 Р.Сольдзі стварыў «авангардысцкую школу» (Э.Петаруці, Р.Форнер), якая садзейнічала развіццю авангардных плыняў (Х.Ле Парк, А.*Берні*, М.Мінухін, Э.Майк-Інтайр, Р.Максіо). Вострыя сац. праблемы, якія хвалююць народа адлюстроўваюць жывапісцы Х.К.*Кастаньіна*, Л.Э.Спілімберга, Б.Кінкуэла Марціна, графікі А.Р.Віга, А.Брыес, разьбяры А.Сібеліна, С.Фітула.

**Музыка**. У нар. музыцы А. пераважае крэольскі фальклор. Музыка індзейцаў-абарыгенаў захавалася толькі на ПдЗ краіны. Сярод песень і танцаў індзейцаў — араві, уайна, карнаваліта; муз. інструменты — кена, пінкілья, сіку і інш. Крэольскі муз. фальклор (песні — яраві, трыстэ, тона, эсціла, танцы — самакуэка, байлесіта, куанда і інш., мастацтва нар. паэтаў-спевакоў — паядораў) дасягнуў росквіту ў 19 ст. Прафес. муз. школа складваецца з канца 19 ст. пад уплывам еўрапейскіх, пераважна італьянскіх, жанраў і стыляў. Яе заснавальнік А.*Вільямс*. У канцы 19 ст. з'явіўся жанр оперы (А.Беруці). У 1929 арганізавана «Група музычнага абнаўлення». Працуюць кампазітары браты Х.М. і Х.З.Кастра, Х.Фішэр, Х.Пас, А.*Хінастэра*, Ф.Кропфль і інш. Муз. цэнтр

Да арт. **Аргенціна**. Руіны царквы Сан-Ігнасіо ў правінцыі Місьёнес. 18 ст.

Да арт. **Аргенціна**. Э. Петаруці. Квінтэт. 1927.

Да арт. **Аргенціна**. Спартыўная зала-басейн у Буэнас-Айрэсе. Арх. Э. Лестан. 1988.

А. — Буэнас-Айрэс, дзе дзейнічаюць: оперны т-р «Калон» (1908); аркестры філарманічны, Нац. сімфанічны, Нац. радыё; Нац. і Муніцыпальная кансерваторыі; Лац.-амер. цэнтр муз. даследаванняў «Тарквата ды Тэлья» і інш.

**Тэатр**. Першы т-р у Буэнас-Айрэсе адкрыты ў 1783. У 1880-я г. ўзнік жанр рамант. меладрамы, т.зв. «тэатр гауча», гал. герой якога — селянін-пастух (гаўча), ахвяра сац. несправядлівасці. На пач. 20 ст. вял. значэнне для развіцця нац. т-ра мела рэаліст. творчасць драматурга Ф.Санчаса. У 1920-я г. ў процівагу камерцыйным узніклі «незалежныя» т-ры, якія вывучалі вопыт еўрап. т-ра, ставілі п'есы нац. драматургаў А.Кусані, А.Драгуна, К.Гарастыса, творы класічнай і тагачаснай драматургіі. Цэнтр тэатр. жыцця А. — Буэнас-Айрэс, дзе працуюць незалежныя («Эль-Пуэбла», «Новы тэатр», «Ла Маскара») і камерцыйныя т-ры (Нац. т-р камедыі, «Аргенціна» і інш.), Нац. ін-т вывучэння т-ра. Сярод рэжысёраў і акцёраў: А.Баэра, П.Аскіні, М.Села, Л.Сандрыні, Ф.Петроне.

**Кіно**. Упершыню кіназдымкі ў А. адбыліся ў 1897. У 1908 зняты першы маст. фільм «Расстрэл у Дарэга» (рэж. М.Гальа). Фільм «Танга смерці» (1917, рэж. Х.А.Ферэйра) паклаў пачатак серыі карцін, сюжэтна звязаных з папулярным у краіне танцам танга. У 1940—50-я г. найб. поспех мелі муз. камедыі з удзелам Л.Торэс, лепшая з якіх — «Узрост кахання» (1953, рэж. Х.Сарасэні). У 1950-я г. ў кіно прыйшло новае пакаленне рэжысёраў: Р.Куін, Л.Муруа, Л.Фавіа, Х.Марцінес Суарэс, творчасць якіх атрымала назву «новае аргенцінскае кіно». У 1956 заснавана Школа дакумент. кіно пад кіраўніцтвам Ф.Біры. Вядомыя рэжысёры: Л.Нільсен, Ф.Э.Саланас, Д.Ліпшыц, Л.Пуэнца.

**Беларусы ў Аргенціне**. Бел. дыяспара ў А. склалася з некалькіх значных эмігрант. хваляў з Беларусі. Гэтаму спрыялі і адпаведныя законы А.: яе ўрад даваў усім эмігрантам роўныя правы, вызваляў іх ад падаткаў і г.д. Прадстаўнікамі 1-й эмігрант. хвалі з Беларусі (канец 19 ст. — 1914, каля 300—400 тыс. чал.) былі сяляне пераважна з Гродзенскай і Віленскай, з 1905 — Мінскай і інш. усх. губерняў (асн. іх ч. пазней вярнулася на Бацькаўшчыну). У час 2-й хвалі эміграцыі ў 1921—39 з Зах. Беларусі каля 40 тыс. чал. перасяліліся ў правінцыі Масіёнес, Мэндэра, Сан-Жуан, каля 60 тыс. — у Буэнас-Айрэс і яго ваколіцы. У 1934 у Буэнас-Айрэсе склалася першае бел. культ.-асв. т-ва «Грамада», у 1935 — «Культура», у 1937 — «Т-ва бібліятэкі імя Івана Луцэвіча», у 1938 — Беларускае культурнае таварыства «Белавежа», у 1939 — «Док Суд», Бел. культ. т-ва ў г. Берысо. У 1939 яны аб'ядналіся ў Федэрацыю бел. арг-цый у А., дзейнасцю якой кіравала ўправа на чале з М.Мярэчкам, У.Гайлевічам і Я.Пятрушакам; выдавала газ. «Эхо», з 1940 — «Белорусский иллюстрирован-

ный календарь». У пач. 2-й сусв. вайны пры Федэрацыі створаны Бел. дэмакр. к-т, які праводзіў збор дабрачынных ахвяраванняў; у 1943 з аналагічнымі мэтамі ўтворaны Славянскі саюз А. У час 3-й хвалі ваен.-паліт. эміграцыі ў 1946—53 бел. дыяспара павялічылася прыкладна на 1—1,5 тыс. чал. Яе прадстаўнікі заснавалі альтэрнатыўнае даваен. т-ва Згуртаванне беларусаў А. (ЗБА; 1948—57, старшыня К.Мярляк), якое ў 1948 увайшло ў Антыкамуніст. славянскую лігу. ЗБА актыўна выступала супраць намаганняў пасольства СССР у А. прадстаўляць інтарэсы Беларусі. У 1949—54 у А. працавала прадстаўніцтва ўрада БНР на чале з Мерляком. З 1960-х г. арг-цыі бел. эміграцыі паступова страчваюць сваю нац. адметнасць: Федэрацыя бел. арг-цый далучылася да Славянскага саюза А., замест ранейшых бел. т-ваў склаўся шэраг клубаў. У сувязі з рэпатрыяцыяй прыхільнікаў бел. нац. ідэі з ліку прац. эміграцыі (каля 15 тыс. чал.), выездам прадстаўнікоў ваенна-паліт. эміграцыі ў ЗША бел. нац. змястоўнасць ў грамадска-культ. жыцці суайчыннікаў амаль знікае. Паступова ліквідуецца і адна з найбуйнейшых арг-цый «Белорусский очаг» (з 1951, налічвала 15—18 тыс. пераважна сав. грамадзян). З 1984 дзейнічае «Федэрацыя сав. грамадзян Аргенціны» (больш за 2 тыс. чал.), куды ўвайшлі прадстаўнікі бел. дыяспары. У сучаснай бел. дыяспары А. каля 150 тыс. прадстаўнікоў бел. эміграцыі розных пакаленняў.

*Літ.*: Пименова Р.А. Аргентина. М., 1987; Культура Аргентины. М., 1977; Arte argentino contemporaneo: [Catalogo]. Madrid, 1976. *П.І.Рогач* (прырода, гаспадарка), *Н.Р.Кошалева* (гісторыя), *Х.-К.Папок* (літаратура), *А.А.Гарахавік* (музыка), *Л.М.Зайцава* (кіно), *Т.А.Папоўская* (беларусы ў Аргенціне).

**АРГЕНЦІ́НСКАЯ КАТЛАВІ́НА**, падводная катлавіна на ПдЗ Атлантычнага ак., паміж мацерыковым схілам Паўд. Амерыкі, Сярэдзінна-Атлантычным хрыбтом і паўн. часткай Паўд.-Антыльскага хрыбта. Пераважная глыб. 5000—5500 м, найб. — 6681 м (у вузкім жолабе на Пд). Грунт — глабігерынавы глей і чырвоная гліна.

**АРГЕНЦІ́НЦЫ**, нацыя, асн. насельніцтва *Аргенціны* (26,64 млн. чал.). Нашчадкі іспанцаў і перасяленцаў з інш. краін Еўропы. Агульная колькасць 26,91 млн. чал. (1987). Гавораць на аргенцінскім дыялекце *іспанскай мовы*. Вернікі пераважна католікі.

**АРГІЛІ́Т** (ад грэч. argillos гліна + ...*літ*), асадкавая горная парода, што ўтварылася ў выніку ўшчыльнення, абязводжвання і цэментацыі глінаў, ад якіх адрозніваецца каменепадобнасцю і нездольнасцю размакаць у вадзе. Цемнаколерная (да чорнага) парода, у асн. гідраслюдзістага ці мяшанага саставу. Утварае масіўныя пласты, мікраслаістыя разнавіднасці. А. характэрны для складкавых абласцей і старажытных адкладаў платформаў. На Беларусі вядомы ў адкладах верхняга пратэразою, дэвону і інш. Выкарыстоўваецца як сыравіна для вытв-сці цэменту, керамзіту, радзей буд. керамікі і вогнетрывалых матэрыялаў.

**АРГІНІ́Н**, L-аміна-δ-гуанідзіналяр'янавая кіслата, $C_6H_{14}O_2N_4$, арганічнае рэчыва з групы *амінакіслот*. У арганізме прысутнічае ў свабодным стане і ў складзе бялкоў, асабліва пратамінаў (да 85%) і гістонаў. У значнай колькасці ёсць у раслінах (асабліва ў рэзервовых і зародкавых органах). Мае ўласцівасці шчолачаў, утварае бясколерныя крышталі, растваральныя ў вадзе. Садзейнічае назапашванню і пераносу азоту. Для дарослых млекакормячых не з'яўляецца незаменнай, а ў маладых яе біясінтэз недастатковы.

Аргтэхніка: электронная пішучая машынка і іншыя прылады аргтэхнікі (уверсе); пераносны персанальны камп'ютэр тыпу «блакнот».

Удзельнічае ва ўтварэнні *мачавіны* і *арніціну* (*арніцінавы цыкл*), *крэаціну*, аргінінфасфату і інш.

**АРГІ́ШЦІ I** (1-я пал. 8 ст. да н.э.), цар *Урарту*. У час яго праўлення Урарту ператварылася ў магутную дзяржаву Б. Усходу. Пакінуў некалькі дзесяткаў клінапісных надпісаў пра перамогі над Асірыяй і будаўніцтва гарадоў Аргішціхінілі і інш.

**АРГІШЦІХІНІ́ЛІ**, горад, пабудаваны каля 776 да н.э. ў час праўлення цара Урарту *Аргішці I*. У 4 ст. да н.э. на яго месцы пабудаваны г. *Армавір* — сталіца Стараж. Арменіі.

**АРГО́** (франц. argot), разнавіднасць маўлення, якая выкарыстоўваецца вузкай сацыяльнай групай людзей з мэтай моўнага адасаблення, адна з формаў існавання мовы. У шырокім сэнсе А. — любыя разнавіднасці прафесійнага нелітаратурнага маўлення (А. лётчыкаў, паляўнічых і інш.). Нярэдка пад А. разумеюць маўленне дэкласаваных і крымінальных элементаў. Да А. адносяць *тайныя мовы*. Тэрмін «жаргон» таксама абазначае сац. разнавіднасць маўлення. Аднак у адрозненне ад А. жаргоны выкарыстоўваюцца больш шырокімі сац. і ўзроставымі групамі насельніцтва.

*Літ.*: Жирмунский В. Национальный язык и социальные диалекты. Л., 1936.

*Н.Б.Мячкоўская.*

**АРГО́Н** (лац. Argon), Ar, хімічны элемент VIII групы перыяд. сістэмы элементаў, ат. н. 18, ат. м. 39,948; інертны газ. Атмасферны А. складаецца з трох стабільных ізатопаў: $^{36}Ar$ (0,337%), $^{38}Ar$ (0,063%), і $^{40}Ar$ (99,6%). У атмасферы $16 \cdot 10^{12}$ т А., у зямной кары $0{,}165 \cdot 10^{12}$ т, у вадзе $0{,}75 \cdot 10^{12}$ т. Адкрыты ў 1894. Газ без колеру і паху, малекула аднаатамная, пры звычайных умовах хімічна інертны, $t_{кіп}$ -185,9 °С. Атрымліваюць раздзяленнем газаў пры глыбокім ахаладжэнні паветра. Выкарыстоўваецца ў металургічных (аргонадугавая зварка алюмініевых і алюмамагніевых сплаваў) і хім. працэсах (пры атрыманні звышчыстых рэчываў), для запаўнення эл. лямпаў і газаразрадных трубак, вызначэння ўзросту мінералаў.

**АРГСУ́ВЯЗЬ**, пашыраная назва сукупнасці сродкаў *апаратыўнай сувязі*, якія павышаюць эфектыўнасць адм.-кіраўнічай працы. Шэраг сродкаў А. належаць да *аргтэхнікі*.

**АРГТЭ́ХНІКА**, арганізацыйная тэхніка, тэхн. сродкі для аўтаматызацыі і механізацыі інжынерна-тэхн., навук.-даследчай, кіраўнічай і прадпрымальніцкай працы. Развіццё і ўдасканаленне А. абумоўлена навук.-тэхн. прагрэсам, ускладненнем працэсаў кіравання і сістэм дыспетчарызацыі, павелічэннем аб'ёму апрацоўваемай інфармацыі. Эфектыўнасць сродкаў А. і зручнасць іх выкарыстання вызначаюцца комплексным падыходам да іх стварэння, рацыяналізацыяй (у т.л. спецыялізаваным абсталяваннем) рабочага месца і службовага памяшкання, выкананнем патрабаванняў *эрганомікі*.

Да А. адносяць *вылічальныя машыны* (у т.л. *мікракалькулятары*, *персанальныя ЭВМ*), капіравальна-размнажальную тэхніку (пішучыя машынкі і апараты аператыўнай паліграфіі і *рэпраграфіі*, *мікрафільмавання*), сродкі захоўвання і аўтам. пошуку дакументаў (картатэкі, спец. шафы, інфармацыйна-пошукавыя сістэмы і прыстасаванні), *чарцёжна-канструктарскую тэхніку*, сродкі апрацоўкі дакументаў (нумаратары, штэмпелявальныя і адрасавальныя машыны і інш.), сродкі запісу і ўзнаўлення мовы, прагляду слайдаў і мікрафільмаў (*дыктафоны*, *магнітафоны*, *дыяскопы*), апаратуру адм.-вытв. сувязі (гл. *Апе-*

*ратыўная сувязь*, *Дыспетчарская сувязь*). Да сродкаў малой А. адносяць таксама канц. прыналежнасці.

**АРГУЛЁЗ**, інвазійная хвароба рыб, якую выклікаюць крывасосныя рачкі-аргулюсы (з роду Argulus). Пашкоджваюцца скура, плаўнікі, шчэлепы моладзі карпа, сазана, стронгі, амураў, судакоў, ляшчоў і інш. Дарослыя рыбы хварэюць рэдка. Лічынкі рачкоў праколваюць хабатком скуру і сасуды цела рыб, сакрэты іх ядавітых залоз таксічна ўздзейнічаюць на арганізм рыб. Прычыняе значныя страты рыбагадоўлі.

**АРГУМЕ́НТ** (лац. argumentum), 1) *суджэнне* (або іх сукупнасць), што прыводзіцца ў пацвярджэнне праўдзівасці інш. суджэння, канцэпцыі, тэорыі. 2) У логіцы — пасылка *доказу* (інакш — падстава або довад доказу); часам А. называюць увесь доказ цалкам. Лагічныя довады для абгрунтавання якога-н. палажэння называюць аргументацыяй. Азначае таксама працэс лагічнага доказу ісцінпасці якога-н. палажэння (суджэння) пры дапамозе А. (аксіём, азначэнняў і выказванняў аб фактах). Аргументацыя ажыццяўляецца ў адпаведнасці з правіламі пабудовы доказаў (правілы катэгарычнага сілагізму, умоўна-раздзяляльнага, умоўнага сілагізму і інш.). У ёй можа быць выкарыстана адвольная, але канечная колькасць А. Спосаб сувязі А. паміж сабой ці з тэзісам (палажэннем, якое аргументуецца) наз. дэманстрацыяй, формай доказу або формай аргументацыі.

*У.К.Лукашэвіч.*

**АРГУМЕ́НТ** у матэматыцы, 1) незалежная пераменная, што стаіць пад знакам *функцыі* і абумоўлівае яе значэнне. А. функцыі f (x) ёсць x. А. функцыі можа быць якой-н. функцыяй іншай пераменнай, напр. А. трыганаметрычнай функцыі cos (ax + b) ёсць ax+b. 2) А. *камплекснага ліку* z = x + iy — вугал φ паміж дадатным напрамкам восі абсцыс і радыус-вектарам пункта з кардынатамі x і y, які з'яўляецца выявай камплекснага ліку на плоскасці ХОУ. Вызначаецца з дакладнасцю да $2\pi$ і звязаны з каардынатамі x і y формулай tg φ = y/x.

**«АРГУМЕ́НТЫ И ФА́КТЫ»**, штотыднёвы інф. бюлетэнь. Выдаецца з 1978 у Маскве на рус. мове. Асвятляе пытанні грамадска-паліт., эканам., культ. і міжнар. жыцця Расіі. Выдае дадаткі, у т.л. з 1993 інфармацыйна-рэкламны дадатак «АіФ на Беларусі».

**АРГУНО́ВЫ**, рускія жывапісцы-партрэтысты. Прыгонныя графаў Шарамецевых. Іван Пятровіч А. (1729—1802), адзін з пачынальнікаў камернага партрэта ў Расіі. Аўтар парадных партрэтаў, у якіх шырока выкарыстаны прыёмы барока (графіні Талстой, Б.П. і А.П. Шарамецевых, усе 1768; невядомай сялянкі, 1784). Яго вучнямі былі А.Ласенка, К.Галавачэўскі, І.Саблуноў. Мікалай Іванавіч А. (1771 — пасля 1829), сын і вучань І.П.Аргунова. У 1816 атрымаў вольную. З 1818 акад. Пецярбургскай АМ. Напісаў шэраг партрэтаў, у т.л. прыгоннай актрысы П.І.Кавалёвай-Жамчуговай (1802).

Да арт. Аргуновы. І.П. Аргуноў. Партрэт невядомай сялянкі. 1784.

*Літ.*: Шарандак Н.П. Иван Аргунов: [Альбом]. Л., 1977.

**АРГУНО́ВЫ**, рускія архітэктары. Прыгонныя графаў Шарамецевых. Фёдар Сямёнавіч А. (каля 1732 — каля 1768). Прадстаўнік рус. барока. Дваюрадны брат жывапісца І.П.Аргунова. Удзельнічаў у буд-ве палаца Шарамецева ў Пецярбургу (1750—55). Па яго праектах пабудаваны кухонны флігель (1775), павільён «Грот» (1755—75), магчыма, аранжарэя (1761—64) у Кускове (Масква). Павел Іванавіч (каля 1768—1806). Прадстаўнік класіцызму. Сын жывапісца І.П.Аргунова. Удзельнічаў у буд-ве драўлянага палаца-тэатра Шарамецевых у Астанкіне (цяпер у межах Масквы, 1791—98); па яго праектах створаны інтэр'еры.

**АРГУ́НЬ**, рака ў Расійскай Федэрацыі і Кітаі, правая састаўляючая р. Амур. Па А. праходзіць ч. граніцы Расіі з Кітаем. Даўж. 1620 км, пл. бас. 164 тыс. км². Пачынаецца ў гарах В.Хінгана, у Кітаі, пад назвай Хайлар. Цячэ пераважна ў шырокай даліне, бліжэй да вусця даліна звужаецца. Жыўленне пераважна дажджавое. Сярэдні расход вады 340 м³/сек. Ледастаў з канца ліст. да пач. мая. У бас. А. 1,8 тыс. азёраў агульнай пл. 50,9 км². Нерэгулярнае суднаходства ад с. Алочы (428 км). З 2-й пал. 17 ст. па А. ішлі гандл. шляхі з Сібіры ў гарады Усх. Кітая.

**А́РГУСЫ**, агульная назва 2 блізкіх родаў птушак сям. фазанавых атр. курападобных. 2 віды: А. чубаты (Rheinartia ocellata) жыве ў горных лясах Лаоса, В'етнама і Малакі, занесены ў Чырв. кнігу МСАП; А. вялікі (Argusianus argus) насяляе сухія лясы паўд. ч. Бірмы, Малакі, Суматры і Калімантана, скрытныя птушкі.

Даўж. самца А. вялікага 1,7—2 м (з іх 1,2 м сярэднія рулявыя пёры хваста), самкі — 0,75 м. Афарбоўка рыжавата-шэрая, у самца падоўжаныя другарадныя пёры з буйнымі плямамі ў вочкі. Самка нясе 2 яйцы, наседжвае 25 сут. Добра пераносіць няволю, размнажаецца.

**АРДА́**, 1) у цюркскіх і мангольскіх народаў першапачатковая ваенна-адм. арг-цыя або аб'яднанне некалькіх плямёнаў, лагер качэўнікаў; у сярэдневяковых цюрка-манг. феад. дзяржавах сталіца, стаўка хана. Адсюль назва дзяржаў, а таксама саюзаў качавых плямёнаў (напр., *Залатая Арда*, Крымская А.). 2) Устарэлы тэрмін, які абазначае першапачатковую форму грамадскай арганізацыі чалавецтва — першабытны статак. 3) У пераносным сэнсе А. — шматлікае неарганізаванае зборышча людзей, натоўп.

**АРДА́ШАЎ** Павел Мікалаевіч (4.12.1865 — пасля 1923), расійскі гісторык. Скончыў Маскоўскі ун-т (1889). Праф. Юр'еўскага (з 1901), Кіеўскага (з 1903) і Сімферопальскага (з 1921) ун-таў. З 1923 выкладаў у Віцебскім пед. ін-це. Гал. праца «Правінцыяльная адміністрацыя ў Францыі ў апошнюю пару старога парадку 1774—89. Правінцыяльныя інтэнданты» (т. 1—3, 1900—06) змяшчае нявыдадзеную адм. перапіску, якая асвятляе парадкі ў Францыі напярэдадні рэвалюцыі канца 18 ст.

**АРДА́ШНЯ**, на Беларусі ў 18 — 1-й пал. 19 ст. прадпрыемства па вытв-сці ардашу (вышэйшага гатунку *паташу*), які выкарыстоўвалі ў вырабе шкла, мыла, сукна, фарбаў, фарфору, пры апрацоўцы скур, адбельванні тканін і інш. На А. было 6—9 медных і жал. катлоў, кадкі для драўлянага попелу, з якога выраблялі ардаш; працавалі 9—10 чал. У 1740—80 А. найб. пашыраны ў Крычаўскім, Прапойскім, Чачэрскім

Узбуджальнік аргулёзу.

староствах, Быхаўскім, Копыскім, Любавіцкім графствах, Гродзенскай эканоміі.

**АРДАШЫ́**, вёска ў Беларусі, у Смаргонскім р-не Гродзенскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 35 км на Пд ад Смаргоні, 224 ад Гродна, 14 км ад чыг. ст. Багданаў. 263 ж., 99 двароў (1994). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі, камбінат быт. абслугоўвання.

**АРДАШЫ́Р I**, Арташыр Папакан (каля 180 — 22.9.239 або 241), заснавальнік і першы цар [224—241] дынастыі *Сасанідаў* у Іране. Служыў у правіцеля парфянскай крэпасці ў Фарсе. Каля 200 стаў правіцелем гэтай крэпасці, падпарадкаваў гарады Фарс, Керман і Гей (сучасны г. Ісфахан). 28.5.224 пры падтрымцы знаці і жрацоў разбіў войскі парфянскага цара Артабана V, пасля чаго Парфянскае царства перастала існаваць. Стварыў *Сасанідаў дзяржаву*. У выніку барацьбы А. з Рымам за Месапатамію і Арменію, войнаў на Усходзе значна пашырыў тэр. дзяржавы.

**АРДЖАНІКІ́ДЗЕ** Рыгор Канстанцінавіч (Сярго; 24.10.1886, с. Гарэша, Грузія — 18.2.1937), партыйны і дзяржаўны дзеяч СССР. За рэв. дзейнасць неаднаразова быў арыштаваны царскім урадам. У 1917 член выканкома Петраградскага Савета і Петраградскага к-та РСДРП(б), адзін з кіраўнікоў Кастр. ўзбр. паўстання. Наведваў Беларусь як прадстаўнік ЦК РСДРП(б) у 1917 і як чл. Рэўваенсавета 16-й арміі Зах. фронту ў 1919. З 1920 старшыня Каўказскага бюро ЦК і сакратар Закаўказскага крайкома РКП(б). З 1926 старшыня ЦК ВКП(б), нарком Рабоча-сялянскай інспекцыі, нам. старшыні СНК і Савета Працы і Абароны СССР. З 1930 старшыня ВСНГ, з 1932 нарком цяжкай прам-сці СССР. З 1930 чл. Палітбюро ЦК ВКП(б). Скончыў жыццё самагубствам.

**А́РДЖУНА**, герой стараж.-індыйскага эпасу «Махабхарата», ідэальны воін, у якога сіла і мужнасць спалучаліся з высакароднасцю і велікадушнасцю. Некалькі гадоў выгнання А. праводзіць на небе і дапамагае багам у бітве з нябеснымі дэманамі.

**АРДО́ВІКСКАЯ СІСТЭ́МА (ПЕРЫ́ЯД)**, ардовік, другая сістэма *палеазойскай эратэмы (групы)*, якая адпавядае другому перыяду палеазойскай эры геал. гісторыі Зямлі. Падсцілаецца кембрыйскай, перакрываецца сілурыйскай сістэмамі. Пачалася каля 500 млн. гадоў назад, доўжылася каля 65 млн. гадоў. Тэрмін А.с. (п.) уведзены англ. геолагам Ч.Лапуарсам у 1879. Адклады А.с. (п.) вядомы на ўсіх кантынентах, удзельнічаюць у будове платформавага чахла большасці платформаў Паўн. паўшар'я, выходзяць на паверхню на ўсіх мацерыках Паўн. паўшар'я (на ўскраінах стараж. платформы *Гандвана*), пашыраны ў складкавых сістэмах Апалачаў, Урала, Алтая, Саянаў і інш. У сярэдзіне ардовіку адбылося максімальнае пашырэнне мора на ўскраіны платформаў, дзе намнажаліся асадкі магутнасцю да 500 м (вапнякі, гліны, пяскі). Ва ўнутр. частках геасінклінальных паясоў, занятых глыбакаводнымі морамі, на тэр. Паўн. Амерыкі, на З Паўд. Амерыкі, у Еўразіі і на ПдУ Аўстраліі ўтварыліся адклады магутнасцю да 10 км (абломкавыя, вулканічныя, крамяністыя, карбанатныя). У канцы ардовіку пачалася *каледонская складкавасць*. Клімат на тэр. сучасных Паўн. Амерыкі, Грэнландыі, Паўн. Еўропы, б. ч. Азіі і Аўстраліі быў гарачы і сухі, астатняя ч. сучаснай сушы адпавядала прыпалярным абласцям, дзе знойдзены сляды ардовікскага мацерыковага зледзянення. Тэр. Беларусі ў ардовіку была сушай, якую абмывала мора на крайнім ПдЗ у Брэсцкай упадзіне (дзе намножылася да 40 м асадкаў) і на ПнЗ у межах Прыбалтыйскай монакліналі (магутнасць асадкаў да 150 м). Намнажаліся карбанатныя і гліністыя пароды — вапнякі з праслоямі мергелю, аалітамі і глаўканітам, гліны і гліністыя вапнякі. У арганічным свеце А.с. (п.) прадстаўлены амаль усе тыпы і большасць класаў марскіх беспазваночных жывёл, сярод раслін пашыраны бактэрыі і водарасці. З'явіліся першыя прымітыўныя пазваночныя; беспазваночныя і расліны выйшлі на сушу. Найб. важныя для расчлянення адкладаў групы ардовікскай фауны: грапталіты, канадонты, трылабіты, брахіяподы і каланіяльныя каралы. Карысныя выкапні: нафта і газ (у Паўн. Амерыцы), гаручыя сланцы (Прыбалтыка), фасфарыты, руды жалеза, марганцу, медзі, свінцу, цынку, кобальту, ёсць золата, рэдказямельныя металы, хрызатыл-азбест, графіт. Стратыграфічны падзел А.с. (п.) у кожным рэгіёне асобны. Найб. пашыраны — на З аддзелы і 6 ярусаў. Да ніжняга аддзела адносяць трэмадокскі і арэнігскі ярусы, да сярэдняга — ланвірнскі, ландэйльскі і карадокскі, верхні ўключае ашгільскі ярус. Гэты падзел пакладзены ў аснову рэгіянальнай стратыграфічнай схемы ардовікскіх адкладаў Беларусі (1981), у якой на падставе характэрных комплексаў брахіяподаў і імшанак вылучаны больш дробныя адзінкі — рэгіянальныя гарызонты.

Аргус чубаты: 1 — самец; 2 — самка.

*Літ.*: Ропот В.Ф., Пушкин В.И. Ордовик Белоруссии. Мн., 1987; Никитин И.Ф. Ордовик // Стратиграфия и палеонтология древнейшего фанерозоя. М., 1984.

*А.С.Махнач, У.І.Пушкін.*

**АРДУБА́ДЫ** Мамед Саід (24.3.1872, г. Ардубад, Азербайджан — 1.5.1950), азербайджанскі пісьменнік. Засл. дз. маст. Азербайджана (1938). Друкаваўся з 1903. У зб-ках вершаў «Бесклапотнасць» (1906), «Бацькаўшчына і воля» (1907) заклік да свабоды, крытыка невуцтва і фанатызму, ідэалізацыя гіст. мінулага, ісламу спалучаецца з асветніцкімі ідэямі. Заснавальнік гіст. рамана ў азерб. л-ры: «Гаўрыз Туманны» (1933—48), «Горад-змагар» (1938), «Падпольны Баку» (1940). Раман «Меч і пяро» (ч. 1—2, 1946—48) прысвечаны азерб. паэту 12 ст. Нізамі. Аўтар лібрэта опер.

**АРДУЭ́Н-МАНСА́Р** (Hardouin-Mansart; уласнае Ардуэн) Жуль (16.4.1646, Парыж — 11.5.1708), французскі архітэктар. Вучань Ф.*Мансара*. Кіраваў перабудовай каралеўскага палаца ў Версалі (1678—89), стварыў (з Ш.Лебрэнам) шэраг інтэр'ераў, у т.л. Люстраную галерэю з заламі Міру і Вайны (1678—86), пабудаваў замак Кланы (1676—83), палац Вялікі Трыанон (1687). Аўтар планіроўкі і забудовы Вандамскай пл. (1685—1701), пл. Перамогі (1685—86), Сабора інвалідаў (1680—1706, усе ў Парыжы). У творчасці А.-М. архітэктура франц. класіцызму дасягнула вышэйшага росквіту.

**АРДЫНА́РАЦ** (ад ням. Ordonnanz вставы), у рускай арміі — ваеннаслужачы афіцэр, унтэр-афіцэр, радавы, прызначаны ў распараджэнне камандуючага (камандзіра) або штаба для выканання іх даручэнняў. А. вылучаліся таксама ў распараджэнне ганаровых асоб, якія прыбылі ў войскі, і ў ганаровыя варты. У канцы 19 ст. пры пяхотных палках былі каманды конных А. У Сав. Арміі А. (звычайна з радавых) вылучаліся ў распараджэнне страявых камандзіраў толькі ў ваен. час.

**АРДЫНА́ЦКІ СУД**, прыватнаўласніцкі суд у *ардынацыях* Рэчы Паспалітай у 16—18 ст. Склад суда вызначаў уладальнік ардынацыі (ардынат), звычайна ў яго ўваходзілі староста (намеснік)

ардынацыі, падстароста, пісар. А.с. мог наз. замкавым або гродскім судом. Аб'ядноўваў функцыі дзярж. *гродскага суда* і *земскага суда*, разглядаў маёмасныя, крымінальныя і грамадзянскія справы. Падсудныміі А.с. былі залежныя ад уладальніка ардынацыі шляхта, мяшчане, ваеннаслужачыя, татарскае і яўрэйскае насельніцтва і інш. Суд вёўся паводле нормаў агульнадзярж. права, мог выносіць і смяротныя прысуды. На Беларусі А.с. дзейнічалі ў Нясвіжы (сесіі таксама ў Міры), Клецку, Давыд-Гарадку.

**АРДЫНА́ЦЫЯ** (польск. ordynacja ад лац. ordinatio упарадкаванне), 1) у сярэдневяковай Польшчы збор прававых нормаў, якімі кіраваліся ўстановы, арг-цыі, суды. 2) Збор прававых нормаў, якія рэгулявалі спадчыннае права на нерухомую маёмасць пэўных маса зменай мясц. балансу цяпла і вільгаці і да т.п.).

**«АРДЫНА́ЦЫЯ» 1638**, «Ардынацыя войска Запарожскага рэестравага», пастанова сойма Рэчы Паспалітай пра абмежаванне правоў казацтва пасля сялянска-казацкага паўстання 1637—38 на Украіне. «А.» абмяжоўвала прывілеі рэестравых казакоў, скасоўвала пасаду гетмана, адмяняла выбарнасць есаулаў і палкоўнікаў; замест гетмана соймам назначаўся камісар, які ажыццяўляў вайсковую і судовую ўладу. У рэестры (на дзярж. службе) было пакінута 6 палкоў па 1 тыс. чал., астатнія пераводзіліся ў паспалітых казакоў (сялян). «А.» страціла значэнне пасля вызв. вайны на Украіне 1648—54.

**«АРДЫНА́ЦЫЯ КАРАЛЕЎСКІХ ПУШЧАЎ У ЛЯСНІЦТВАХ БЫЛО́ГА ВЯЛІ́КАГА КНЯ́СТВА ЛІТО́ЎСКАГА»**, «Ординация королевских пущ в лесничествах бывшего Великого княжества Литовского», вопіс каралеўскіх лясных масіваў ВКЛ 1636—40. Выдадзены Віленскай археагр. камісіяй паралельна на польскай і рус. мовах (Вільня, 1871). Ардынацыя (упарадкаванне) мела на мэце ўстанаўленне межаў каралеўскіх пушчаў, вызначэнне правоў шляхты і мясц. насельніцтва на карыстанне імі, арганізацыю кіравання лясной гаспадаркай і вызначэнне статуса асоб, якія выконвалі спец. абавязкі ў створаных лясніцтвах. Адзначаны населеныя пункты на тэр. лясніцтваў, пералічаны сяляне, іх павіннасці, колькасць зямлі ў гаспадарках; часам дакументы шляхты на права валодання і карыстання лясамі; апісаны азёры, рэчкі, лугі. *В.Ф.Голубеў.*

гнацкіх родаў у Рэчы Паспалітай, а таксама адпаведнае зямельнае ўладанне. Асн. прынцыпы А. — непадзельнасць і неадчужальнасць зямельнага ўладання, якое пасля смерці ўладальніка (ардыната) пераходзіла да старэйшага нашчадка старэйшай мужчынскай лініі (жанчыны за нашчадкаў не лічыліся). Першыя А. (Нясвіжская і Клецкая на Беларусі, Альцкая на Украіне) заснаваны Радзівіламі ў 1586, зацверджаны соймам у 1589. Уласныя А. стварылі магнаты Замойскія (зацверджана ў 1589), Мышкоўскія (1601), Астрожскія (1609), Сулкоўскія (18 ст.). А. працягвалі існаваць у Рас. імперыі і Польск. рэспубліцы; скасаваны соймам у 1939.

**АРДЫНА́ЦЫЯ** ў экалогіі, метад аналізу эка- і геасістэм. Заключаецца ў размеркаванні відаў або згуртаванняў жывых арганізмаў па меры змены аднаго або некалькіх карэлявальных фактараў (напр., змена відавога складу расліннасці і мноства асобін кожнага з відаў з павелічэннем засалення глебаў

Віцебска (1654), кіраваў штурмам Дрысы (1655). Ваявода Друі (1654), Кокнеса (1656—61). Заснаваў на Зах. Дзвіне суднаверф. У 1658 у Валіесары заключыў на 3 гады перамір'е са Швецыяй, паводле якога за Расіяй заставаліся заваяваныя ў Лівоніі землі. Прыхільнік саюзу з Рэччу Паспалітай для барацьбы супраць Швецыі. Падпісаў *Андросаўскае перамір'е 1667*. У 1671 пастрыгся ў манахі. У 1679 вёў перагаворы з Рэччу Паспалітай, каб прадоўжыць Андросаўскае перамір'е. Ініцыятар стварэння паштовай сувязі паміж Масквою, Рыгай і Вільняй.

*Літ.*: «Око всей великой России»: Об истории рус. дипломатич. службы XVI—XVII веков. М., 1989. С. 108—146.

**АРДЫ́НСКІ ВЫ́ХАД**, даніна з рус. земляў *Залатой Ардзе* ў час мангола-татарскага панавання 13—15 ст. Збіраўся з усяго насельніцтва, акрамя духавенства. Велічыня паброю была не пастаянная, а залежала ад «запросаў» хана. Напачатку А.в. збіралі баскакі, адкупшчыкі-мусульмане. Нар. паўстанні ў рус. княствах (1257, 1259, 1262, 1289) супраць баскакаў прымусілі ханаў перадаць збор даніны рус. князям. Даніна ішла ў Залатую Арду праз вял. князя уладзімірскага. Пасля *Кулікоўскай бітвы 1380* А.в. плаціліся нерэгулярна, з 1470-х г. перасталі плаціць зусім.

**АРДЫ́НШЧЫНА**, дзярж. падатак у ВКЛ у 15—16 ст., які ішоў на выплату даніны крымскаму хану. Накладвалася на воласць, горад ці мястэчка, спаганялася з мяшчан і сялян. У гады спагнання А. з падаткаплацельшчыкаў, як правіла, не збіраўся дзярж. падатак на патрэбы войска — *сярэбшчына*. У адрозненне ад грашовай сярэбшчыны А. пераважна сплачвалася пушнінай.

*П.А.Лойка.*

**АРДЫШЭ́ВА**, возера ў Беларусі, у Сенненскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Лучоса. За 46 км на У ад г. Сянно. Пл. 0,52 км$^2$. Даўж. 1,22 км, найб. шыр. 0,74 км, найб. глыб. 2,4 м. Пл. вадазбору каля 6 км$^2$. Даўж. берагавой лініі 3,2 км. Берагі нізкія, сплавінныя. Дно выслана сапрапелем, каля берагоў пясчанае. Схілы катлавіны да 3 м пад лесам. Зарастае да глыб. 1 м. Упадае ручай, выцякаюць рэкі Зелянуха і Ардышэўка, ручай у воз. Дзевінскае.

**АРДЭ́НСКАЯ АПЕРА́ЦЫЯ 1944—45**, контрнаступленне ням. армій у раёне Ардэнаў (Бельгія) 16.12.1944—28.1.1945 з мэтай разграміць амер.-англ. войскі і дасягнуць пералому ў 2-й сусв. вайне на карысць Германіі. 16 снеж. ням. 6-я танк. армія СС і 5-я танк. армія, аб'яднаныя ў групу армій «Б» (фельдмаршал В.Модэль) пачалі наступленне ў раёне *«Зігфрыда лініі»*. 4 амер. дывізіі, якія абараняліся на фронце працягласцю ў 115 км, панеслі вял. страты і адступілі. Да канца снеж. ням. войскі пашырылі прарыў да 90 км і прасунуліся да 100 км углыб. Саюзнае камандаванне перакінула да месца прарыву

буйныя сілы войскаў і авіяцыі. У выніку паспяховага контрудару 3-й амер. арміі наступленне герм. войскаў было прыпынена, аднак становішча саюзнікаў заставалася напружаным. 12 студз. па іх просьбе сав. войскі пачалі (на 8 дзён раней запланаванага тэрміну) *Вісла-Одэрскую аперацыю 1945*. Ням. камандаванне вымушана было адмовіцца ад наступлення на захадзе і перакінуць 7 дывізій на сав.-герм. фронт. Да канца студз. саюзнікі аднавілі становішча на Зах. фронце. Іх страты ў гэтай аперацыі склалі каля 77 тыс. чал., страты ням. войскаў — каля 93 тыс. чал.

**АРДЭ́НЫ** (Ardennes), узвышша, зах. працяг *Рэйнскіх Сланцавых гор* на Пд Бельгіі, часткова ў Францыі і Люксембургу. Працягласць 160 км. Выш. каля 400 м, найб. — 694 м (г. Батрандж). Платопадобная паверхня, расчлянёная на асобныя масівы глыбокімі далінамі рэк сістэмы Мааса. Складзены з крышт. і гліністых сланцаў, пясчанікаў і вапнякоў, скамечаных у складкі ў герцынскі арагенез. Радовішчы каменнага вугалю, жал. руды, мінер. крыніцы. Клімат умераны марскі. Шмат тарфяных балотаў. Букавыя і дубова-бярозавыя лясы, пасадкі елкі.

**АР'ЕРГА́РД** (ад франц. arrière задні, тылавы + garde варта), мотастралковая (танкавая) часць (падраздзяленне), прызначана для прыкрыцця войскаў у час іх адыходу або маршу ад фронту ў тыл. Ідзе следам за гал. сіламі. Задача А. затрымаць наступаючыя сілы праціўніка, выйграць час, неабходны для адрыву гал. сіл, і забяспечыць ім планамерны адыход на новыя рубяжы. Склад. задачы і аддаленасць А. ад гал. сіл залежыць ад памеру калоны і баявых абставін. Звычайна асн. сілы А. ўзмацняюцца ці падтрымліваюцца інш. спец. падраздзяленнямі і авіяцыяй.

**АРЖА́НІЦА**, рака ў Беларусі, у Глыбоцкім р-не Віцебскай вобл., левы прыток р. Бярозаўка (бас. Зах. Дзвіны). Даўж. 35 км. Пл. вадазбору 130 км². Пачынаецца за 2 км на ПнУ ад в. Крулеўшчына, цячэ ў межах Свянцянскіх град. Даліна трапецападобная, шыр. 0,4—1 км, ніжэй воз. Чачалёўскае (праз якое працякае) 2—2,5 км. Рэчышча шыр. 12—16 м, на працяту 19 км каналізаванае.

**АРЖА́ННІКАВА** Таццяна Пятроўна (н. 20.11.1964, Віцебск), бел. спартсменка (спарт. гімнастыка). Чэмпіёнка свету 1978 у камандным першынстве ў складзе каманды СССР, неаднаразовы пераможца і прызёр міжнар. і ўсесаюзных спаборніцтваў.

**АРЖАНСО́Н** (d'Argenson) Рэне Луі (18.10.1694—26.1.1757), французскі вучоны-эканаміст. Быў міністрам замежных спраў пры Людовіку XV. Пасля выхаду ў адстаўку крытыкаваў урад, патрабаваў абмежавання яго ўлады, ліквідацыі саслоўных прывілеяў і неўмяшання дзяржавы ў гасп. дзейнасць. Выступаў супраць меркантылізму, за свабоду гандлю. Навук. погляды А. блізкія да ідэй *фізіякратаў*. Гал. твор «Роздум аб мінулым і цяперашнім кіраванні Францыі» (каля 1737, выд. 1764).

**АРЖАХО́ЎСКІ** Ігар Вацлававіч (н. 11.5.1933, Мінск), бел. гісторык. Д-р гіст. н. (1976), праф. (1980). Скончыў Горкаўскі ун-т (1961). З 1963 працаваў у гэтым ун-це. З 1976 заг. кафедры рас. і слав. гісторыі БДУ. Даследуе ўнутр. палітыку і развіццё грамадска-паліт. думкі ў Расіі 19 ст. Адзін з аўтараў вучэбных дапаможнікаў для вучняў 7, 8, 10-х класаў па сусв. гісторыі.

**АРЗАМА́С**, горад у Расіі, раённы цэнтр у Ніжагародскай вобл., на р.Цёша (прыток Акі). Узнік у 1578 як горад-крэпасць. 111,3 тыс. ж. (1994). Вузел чыг. ліній і аўтадарог. Машынабудаванне (вытв-сць рухавікоў, запчастак да аўтамабіляў, прылад, абсталявання для камунальнай гаспадаркі і інш.), лёгкая, харч. прам-сць. У А. была першая ў Расіі правінцыяльная школа жывапісу (1802—62).

Аркі: 1 — паўцыркульная; 2 — з замковым каменем; 3 — спічастая; 4 — трохлопасцевая.

Аркі брамы Кальварыйскага касцёла ў Мінску.

**«АРЗАМА́С»**, літаратурны гурток у Пецярбургу ў 1815—18. Удзельнікі В.Жукоўскі, К.Бацюшкаў, П.Вяземскі, В.Пушкін, А.Пушкін, А.Тургенеў і інш. «Арзамасцы» былі прыхільнікамі моўнай рэформы М.Карамзіна (выступалі за набліжэнне паэт. мовы да народнай), імкнуліся да стварэння новых маст. формаў у л-ры, адмаўлялі састарэлыя каноны класіцызму. Выступалі з крытыкай дзейнасці прыхільнікаў «Гуртка аматараў рускага слова».

**АРЗАМА́САЎ** Іван Цімафеевіч (8.8.1922, с. В. Кулікі Ракшынскага р-на Тамбоўскай вобл., Расія — 23.12.1990), бел. вучоны ў галіне паразіталогіі. Д-р біял. н. (1972). Скончыў Казанскі ун-т (1952). У 1952—54 навук. супрацоўнік заказніка «Белавежская Пушча», з 1958 у Ін-це заалогіі АН Беларусі (у 1981—85 нам. дырэктара). Навук. працы па комплексным даследаванні паразіталагічнай сітуацыі ў прыродных ландшафтах, біялогіі і экалогіі эктапаразітаў — пераносчыкаў трансмісіўных інфекцый, небяспечных для чалавека і с.-г. жывёл.

*Тв.*: Иксодовые клещи. Мн., 1961; Гамазовые клещи фауны Белоруссии. Мн., 1968; Структура паразитоценозов грызунов геоботанических подзон Белоруссии. Мн., 1983 (разам з І.В.Меркушавай, І.В.Чыкілеўскай).

**АРЗНІ́**, кліматабальнеалагічны курорт у Арменіі. У цясніне р. Раздан на выш. 1300 м, паблізу Ерэвана. Засн. ў 1925. Клімат умерана цёплы з гарачым летам і цёплай восенню. Субтэрмальныя мінер. воды, прыдатныя на ванны, арашэнні, кішэчныя прамыванні, піццё. Санаторыі спецыялізаваныя на лячэнні хвароб сардэчна-сасудзістай сістэмы, а таксама спадарожных хвароб страўніка, кішэчніка, печані, жоўцевага пузыра, гінекалагічнай сферы. Завод па разліву мінер. вады «Арзні». Паблізу арх. комплексы Эчміядзіна, Гегарда, крэпасці Гарні, воз. Севан.

**А́РКА** (ад лац. arcus дуга, выгін), у архітэктуры крывалінейнае перакрыцце праёма ў сцяне ці прасторы паміж 2 апорамі (слупамі, калонамі, пілонамі і г.д.).

Каменныя А. ўпершыню з'явіліся ў архітэктуры Стараж. Усходу. Пашыраны ў ант. Рыме, важны арх.-канструкцыйны і дэкар. элемент у архітэктуры рэнесансу, барока, класіцызму. Робяць А. з каменю, жалезабетону, металу, цэглы, дрэва. Паводле формы крывой адрозніваюць А.: паўкруглыя, ці паўцыркульныя (найб. пашыраны від), спічастыя (характэрны для стылю готыкі), падковападобныя (пашыраны ў архітэктуры араб. краін), кілепадобныя (у выглядзе какошніка), шматлопасцевыя, паўзубчыя (з апорамі рознай вышыні) і інш. У сучасным буд-ве А. выкарыстоўваюць як нясучыя элементы пралётных збудаванняў, мастоў, пуцеправодаў. Гл. таксама *Аркада*, *Аркатура*, *Аркбутан*.

**А́РКА ТРЫУМФА́ЛЬНАЯ**, трыумфальная брама, пастаяннае або часовае манументальнае афармленне праезду (звычайна арачнае) або збудаванне ў гонар ваеннай перамогі, гістарычнай падзеі ці асобы. Брамы з адным ці трыма арачнымі пралётамі звычайна маюць насычаны арх.-пластычны дэкор: аздоблены скульпту-

рай, памятнымі надпісамі. Узніклі ў Стараж. Рыме, дзе прызначаліся для цырымоніі ўезду пераможцы: аркі Ціта (81), Септымія Севера (203), Канстанціна (315). Накшталт іх пабудаваны аркі ў Парыжы на пл. Карузель (1806, арх. Ш.Персье і П.Фантэн) і пл. Шарля дэ Голя (1837, арх. Ж.Ф.Шальгрэн). У Расіі А.т. будавалі ў гонар ваен. перамог (Трыумфальныя вароты ў Маскве, 1834, В.Бавэ; Неўскія трыумфальныя вароты ў С.-Пецярбургу, 1833, арх. В.Стасаў).

**АРКА́ДА** (франц. arcade), шэраг аднолькавых па велічыні і абрысах *арак*, якія апіраюцца на слупы або калоны і ствараюць разам з імі рытмічны паслядоўны рад. Бываюць канструкцыйныя (успрымаюць нагрузку верхніх частак будынкаў) і дэкар. (стаяць асобна або ўтвараюць «сляпыя» А.). А. з'явіліся ў архітэктуры Стараж. Рыма. На Беларусі пашырыліся з 16 ст. ў архітэктуры рэнесансу, барока, класіцызму ў адкрытых галерэях гандл. радоў (у Пінску, Нясвіжы), палацаў (у г.п. Ружаны Пружанскага р-на), гасп. будынкаў (лямус брыгіцкага кляштара ў Гродне), а таксама як дэкар. элемент — *аркатура*.

**АРКА́ДЗІЯ**, клімата-бальнеагразевы курорт на ўзбярэжжы Чорнага м., у межах г. Адэса. Засн. ў 1921. Клімат тыповы для прыморскай стэпавай зоны, спрыяльны для паветраных і сонечных ванн, начнога сну на беразе мора, аэраіонатэрапіі. Дадатковыя лек. фактары — ліманная гразь, марскія купанні з чэрвеня да жніўня, штучныя мінер. ванны на аснове марской вады. Пераважная спецыялізацыя санаторных устаноў (больш за 20) — лячэнне органаў дыхання, нерв., сардэчна-сасудзістых і гінекалагічных хвароб. Пансіянаты, дамы адпачынку, турбазы, паркі.

**АРКА́ДЗЬЕЎ** (сапр. Ц і в у н ч ы к) Аркадзь Станіслававіч (13.11.1897, в. Журбілавічы Навагрудскага р-на Гродзенскай вобл. — 27.2.1969), бел. акцёр, рэжысёр. Засл. арт. Беларусі (1961). Скончыў тэатр. студыю ў Омску (1921). Арганізатар, гал. рэжысёр і вядучы акцёр *Бабруйскага вандроўнага беларускага драматычнага тэатра* (з 1956), рэжысёр Бабруйскага муз.-драм. т-ра і Магілёўскага абл. т-ра муз. камедыі (1963—66). Найб. значныя пастаноўкі: «Раскіданае гняздо» Я.Купалы (1957, выканаў таксама ролю Лявона Зябліка), «Вясёлка» М.Зарудnага (1958), «Апошні прыпынак» Э.М.Рэмарка (1961), «Вяселле ў Малінаўцы» Б.Аляксандрава (1962).

*Літ.*: Вавула Г. Аркадзь Аркадзьеў // Майстры беларускай сцэны. Мн., 1978. Кн. 3.

**АРКА́ДЫЯ** (Arkadia), гіст. вобласць у цэнтральнай гарыстай ч. Пелапанеса ў Грэцыі. У канцы 2-га тыс. да н.э. насельніцтва А. — ахейцы, якіх выцеснілі сюды дарыйцы. З 550-х г. да н.э. пад гегемоніяй Спарты. У 371 да н.э. фіванскі палкаводзец Эпамінонд пасля перамогі над спартанцамі заснаваў у А. г. Мегалопаліс і стварыў саюз гарадоў, у які ўвайшлі таксама Мантынея, Тэгея, Архамен (з 250 да н.э. належалі *Ахейскаму саюзу*). У 146 да н.э. А. адышла да Рыма. У ант. л-ры і пастаралях 16—18 ст. А. апісвалася як шчаслівая райская краіна пастухоў.

**АРКА́ДЫЯ**, вёска ў Беларусі, у Гершонскім с/с Брэсцкага р-на. Цэнтр калгаса «Прыбужжа». За 6 км на Пд ад Брэста, 7 км ад чыг. ст. Гершоны, каля аўтадарогі Брэст—Ковель. 665 ж., 224 двары (1995). Афанасьеўская капліца — помнік архітэктуры 19—20 ст.

**АРКАНА́ДА** (Arconada) Сесар Муньёс (5.12.1898, Астудыльё — 10.3.1964), іспанскі пісьменнік. Удзельнік грамадзянскай вайны ў Іспаніі 1936—39. З 1939 жыў у СССР. Выдаў зб-кі сюррэалістычных вершаў «Смага» (1921), «Горад» (1928). У раманах «Турбіна» (1930), «Беднякі супраць багацеяў» (1933), «Падзел зямлі» (1934) карціны жыцця іспанскай вёскі 1920—30-х г. Тэме грамадз. вайны ў Іспаніі прысвяціў раман «Рака Таха» (1938). Аўтар паэмы «Далорэс» (1949), трагедыі «Мануэла Санчэс» (1949).

*Тв.*: Рус. пер. — Река Тахо. М., 1941; Испания непобедима: Сб. рассказов. М., 1943.

Аркада Ружанскага палаца.




**АРКА́НЗАС** (Arkansas), рака ў ЗША, правы прыток Місісіпі. Даўж. 2410 км, пл. бас. 416 тыс. км². Пачынаецца ў Скалістых гарах, цячэ па вузкіх глыбокіх цясніны (Ройял-Гордж, Гранд-Каньён і інш.), затым з З на У па Вялікіх і на ПдУ па Цэнтр. раўнінах. Мае няўстойлівае рэчышча ў перыяды паводак. Паўнаводная вясною ад раставання снягоў і летам ад дажджоў; характэрны летнія ліўневыя паводкі. Ваганні ўзроўню дасягаюць 8—10 м (каля г. Літл-Рок). Сярэднегадавы расход вады каля 1,8 тыс. м³/с. Суднаходная на 1 тыс. км ад вусця. У сістэме А. буйныя вадасховішчы. Выкарыстоўваецца на арашэнне. На А. гарады Уічыта, Талса, Літл-Рок.

**АРКА́НЗАС** (Arcansas), штат на Пд ЗША. Уваходзіць у групу штатаў Паўд.-Зах. Цэнтра. Пл. 137,8 тыс. км², нас. 2424 тыс. чал. (1993). Адм. ц. — г. Літл-Рок. Буйныя гарады: Форт-Сміт, Блайтвіл, Феетвіл. Гар. насельніцтва каля 50%. На ПнЗ плато Азарк (823 м), на ПдЗ горы Уашыта, на У і ПдУ урадлівая даліна Місісіпі і Берагавыя Раўніны. Клімат субтрапічны, вільготны. Сярэдняя т-ра (у г. Літл-Рок) студз. 6 °С, ліп. 28 °С, ападкаў 1250 мм за год. Гал. рэкі Місісіпі з прытокамі Арканзас і Уайт-Рывер. Больш як палавіна тэрыторыі пад лесам (хвоя, белы дуб, кіпарыс, каменнае дрэва). Аснова эканомікі — апрацоўчая прам-сць, земляробства, турызм, лясная гаспадарка. Прамысловасць: хім., лесаапр., папяровая, электратэхн., маш.-буд., нафтаперапр., металургічная (выплаўка алюмінію і сталі), швейная і інш. Здабыча буд. пяскоў і каменю, баксітаў, нафты і газу. Вырошчваюць сою, рыс, бавоўнік, пшаніцу, кукурузу, агародніну, вінаград, садавіну. Гадуюць свіней і птушак. Адкорм буйн. раг. жывёлы, вырошчванне бройлераў. Транспарт: рачны (на Місісіпі і Арканзасе), чыг., аўтамаб., ёсць газа- і нафтаправоды. Турызм. Курорты на плато Азарк. *М.С.Вайтовіч.*

**АРКА́Р**, млекакормячая жывёла, гл. *Архар*.

**АРКАТА́Г**, Пржавальскага хрыбет, на З Кітая, у цэнтр. ч. Куньлуня. Даўж. каля 650 км. Выш. да 7723 м (г. Улугмузтаг). Складзены пераважна з гранітаў, гнейсаў, пясчанікаў. Выраўнаваныя вяршыні, каменныя восыпы, галечнікава-друзавыя пустыні, азёрныя ўпадзіны, рачныя даліны. Невял. ледавікі. Адкрыты рускім падарожнікам М.М.Пржавальскім (1884).

**АРКАТУ́РА** (ням. Arkatur), рытмічны рад дэкаратыўных несапраўдных арак на фасадах будынкаў або на сценах ану-

тры памяшканняў. Выконвае ролю *фрыза*, зрэдку дапоўненага кансолямі, паўкалонкамі, лапаткамі. Узнікла ў раманскай архітэктуры 10—13 ст. Нашырылася ў збудаваннях стыляў готыкі і рэнесансу, у якіх выкарыстоўваліся спічастыя і круглыя аркі ў аздабленні сцен, вежаў, франтонаў, у несапраўднай готыцы і псеўдарускім стылі.

**АРКАШО́Н** (Arcachon), кліматычны курорт на беразе Біскайскага заліва ў Францыі. На ПдЗ ад г. Бардо. Узнік у 19 ст. Мяккі марскі клімат без рэзкіх ваганняў т-ры, пляж даўж. каля 6 км, дзюны, хвойнікі. Шматлікія санаторыі і гасцініцы. Буйнейшы ў Еўропе цэнтр па здабычы вустрыц.

**АРКБУТА́Н** (франц. arcboutant), вонкавая паўарка. Перадае гарыз. распор сцяны гал. нефа базілікальнага храма на апорныя слупы — *контрфорсы*, што дае магчымасць аблегчыць канструкцыю сцен, павялічыць пралёт гал. нефа і паменшыць сячэнне слупоў, робіць інтэр'ер больш прасторным. А. ўзніклі ў архітэктуры *готыкі*.

**АРКЕБУ́ЗА** (франц. arquebuse), адзін з першапачатковых узораў зах.-еўрап. ручной агнястрэльнай зброі. З'явілася ў 1-й трэці 15 ст. Зараджалася з дула каменнымі і свінцовымі кулямі. Парахавы зарад падпальваўся ад рукі праз запальную адтуліну ў ствале, пазней — пры дапамозе кнотавага замка. У 16 ст. А. заменена *мушкетам*.

**АРКЕ́СТР** (ад грэч. orchēstra пляцоўка перад сцэнай у стараж.-грэч. тэатры), калектыў інструменталістаў для сумеснага выканання створанай для яго музыкі. А. бываюць мяшаныя, якія ўключаюць інструменты розных груп (сімфанічны, эстрадны) і аднародныя (струнны, духавы, ударных інструментаў). Паводле функцыі вылучаюць А. оперныя, ваенныя, эстрадныя і інш. Вышэйшы тып — *сімфанічны аркестр* — малы і вялікі. Рухомасцю складу адрозніваецца *камерны аркестр*, які не заўсёды можна дакладна адмежаваць ад камернага ансамбля. Асаблівы тып — *аркестр народных інструментаў*.

Вял. інстр. ансамблі вядомы ў антычнасці, сярэднявеччы, у эпоху Адраджэння (літ. крыніцы 16 ст. сведчаць, што падобныя ансамблі існавалі і на Беларусі), аднак іх вызначалі спарадычнасць дзеяння і нестабільнасць складу. Рэгулярныя А. паявіліся на мяжы 16—17 ст. з узнікненнем оперы, араторыі, кантаты, у якіх на А. ўскладалася функцыя суправаджэння вак. партый. Тыпы А., іх прызначэнне гістарычна мяняліся ў залежнасці ад развіцця муз. інструментаў і выканальніцтва, эвалюцыі арк. мыслення кампазітараў, ідэйна-стыліст. тэндэнцый.

Звесткі пра А. на Беларусі сягаюць у 16 ст. («літоўская капэла»). У 18 ст. вядомы розныя тыпы А.: т. зв. «яначарская музыка» (Шклоў, Нясвіж, Гродна), рагавая музыка (Нясвіж, Шклоў), «хатняя музыка» (Горы-Горкі, Гродна, Нясвіж), духавыя, а таксама малыя сімф. А. ранняклясічнага складу — капэлы (гл. *Прыгонныя аркестры і капэлы*). Вядома пра існаванне «касцельнай музыкі» ў 18 — 1-й пал. 19 ст. ў Гродне, Слоніме, Мінску, Пінску, Нясвіжы, Будславе і інш. У канцы 19 — пач. 20 ст. прыкметную ролю ў грамадска-культ. жыцці адыгрывалі сімф. і духавыя А., у т.л. ў Мінску (гл. *Мінскі гарадскі аркестр*), Віцебску, Слуцку, Гродне. У 1919—21 створаны сімф. А. ў Мінску, Віцебску, Гомелі, Магілёве на базе нар. кансерваторый, муз. школ, пазней муз. тэхнікумаў і драм. т-раў. Прафесійныя А. ў Беларусі (1995): *Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр Рэспублікі Беларусь, Сімфанічны аркестр Беларускага тэлебачання і радыё*, сімфанічныя А. Дзярж. т-ра оперы і балета і Дзярж. т-ра муз. камедыі, *Дзяржаўны камерны аркестр Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўны аркестр сімфанічнай і эстраднай музыкі Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўны акадэмічны народны аркестр Рэспублікі Беларусь, Ваенны аркестр Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь*, мінскі духавы аркестр «Няміга» і інш.

*Літ.*: Барсова И.А. Книга об оркестре. 2 изд. М., 1978. *І.Дз.Назіна.*

**Аркатура** на фасадзе царквы Санты-Марыя э Даната ў Венецыі. 12 ст.

**АРКЕ́СТР НАРО́ДНЫХ ІНСТРУМЕ́НТАЎ**, тып аркестра, нацыянальна спецыфічны паводле складу муз. інструментаў, характару гучання і спалучэння традыцый нар. інструменталізму і сімф. культуры. Першы А.н.і. створаны ў 1896 В.Андрэевым (Вялікарускі аркестр). У 1930-я г. на яго ўзор арганізаваны аркестры ў Арменіі, Казахстане, Узбекістане і інш. У 1930 пачаў сваю дзейнасць *Дзяржаўны акадэмічны народны аркестр Рэспублікі Беларусь* імя І.І.Жыновіча. Прафесіяналізацыя А.н.і. абумовіла ўдасканаленне і ўтварэнне сем'яў тых інструментаў, якія склалі аснову іх пэўных нац. разнавіднасцяў (напр., бел. цымбалаў), пабудову аркестраў на ўзор сімфанічнага (падзел інструментаў на групы).

*І.Дз.Назіна.*

**Аркбутан.**

**АРКЕСТРО́ЎКА**, гл. ў арт. *Інструментоўка*.

**АРКНЕ́ЙСКІЯ АСТРАВЫ́** (Orkney Islands), архіпелаг у Атлантычным ак. каля паўн. ўзбярэжжа Шатландыі; тэр. Вялікабрытаніі. Каля 70 а-воў, самы вялікі — в-аў Мэйнлэнд. Пл. каля 1000 км². Выш. да 477 м. Фіёрды, азёры. Лугі, верасоўнікі. Авечкагадоўля. Рыбалоўства. Ткацтва. Нафтавы тэрмінал Паўночнага мора. Гал. парты Керкуол, Флота.

**Аркебуза.**

**АРКО́ЗЫ** (франц. arcose), аркозавыя пясчанікі, абломкавыя грубазярністыя горныя пароды пераважна з палявых шпатаў, кварцу, слюды і цэментавальнага (гліністага, карбанатнага) рэчыва. Колер ружовы ці чырвоны. Утвараюцца на перыферыі шчытоў і выступаў крышт. фундамента ў выніку разбурэння гранітаў, гнейсаў і блізкіх да іх па складзе горных парод. Сыравіна для атрымання друзу.

**АРКО́НА** (Arkona), рэлігійны цэнтр балтыйскіх славян 10—12 ст. на паўн. мысе в-ва Руген (слав. Руяна) у паўд. частцы Балтыйскага м. (Германія). З З была ўмацавана валам вышынёй 10—13 м. А. кіраваў вярх. жрэц бога Святавіта. У 1169 дацкі кароль Вальдэмар I разбурыў А. і вывез яе скарбы ў Данію. Раскопкамі ўскрыты рэшткі квадратнага ў плане храма (20 × 20 м), апісанага сярэдневяковым дацкім аўтарам Саксонам Граматыкам, плошча сходаў, шэраг жытлаў уздоўж вала. Унутры храма выяўлены фундаменты 4 драўляных слупоў свяцілішча і каменны падмурак драўлянай статуі чатырохгаловага бога.

**АРКТАГЕ́Я**, фауністычнае царства сушы; займае Паўн. Амерыку, Паўн. Афрыку і Еўразію (за выключэннем Індастана і Індакітая). Уключае адзіную

вобласць — Галарктычную, якую часам падзяляюць на Палеарктыку і Неарктыку.

**АРКТАТРАЦІ́ЧНАЯ ФЛО́РА**, існавала ад пач. палеагену да сярэдзіны неагену на сушы ў межах сучасных арктычных ускраін і ўмераных шыротаў Еўразіі і Паўн. Амерыкі. Вылучана О.Геерам па знаходках у Грэнландыі, на Шпіцбергене і інш. У Еўропе існавала да сярэдзіны міяцэну.

Склалася на аснове трапічнай флоры мелавога перыяду ва ўмовах масавага пашырэння пакрытанасенных, развіцця лістападнай расліннасці. У А.ф. былі пальмы сабаль, хлебнае дрэва, эўкаліпт, фікус, камфарны лаўр, пазней гінкга, магнолія, платан, каштан, грэцкі арэх, бук, дуб, вяз, вярба, таполя, арэшнік і інш. Па меры пахаладання адбывалася замяшчэнне раслін менш цеплалюбнымі, фарміравалася сучасная *занальная расліннасць*. А.ф. паслужыла асновай для фарміравання сучаснай флоры Еўразіі і Паўн. Амерыкі.

Да арт. **Арктыка.** Арктычны ландшафт.

**АРКТУ́Р**, α Валапаса, зорка нулявой *зорнай велічыні* (-0,1 візуальнай зорнай велічыні). Самая яркая зорка Паўночнага паўшар'я неба. Свяцільнасць у 80 разоў большая за сонечную. Адлегласць ад Сонца 10 пс. Мае вялікі ўласны рух (2,3″ за год).

**А́РКТЫКА**, паўночная палярная вобласць Зямлі, якая ўключае паўн. ўскраіны Еўразіі і Паўн. Амерыкі (акрамя паўд. часткі Грэнландыі і п-ва Лабрадор), амаль увесь Паўн. Ледавіты акіян з астравамі (акрамя Усх. і Паўд. Нарвежскага мора) і прылеглыя часткі Атлантычнага і Ціхага акіянаў. Паўд. мяжа на сушы суадносіцца з паўд. мяжой зоны тундры (ізатэрма 10 °С самага цёплага месяца — ліп. ці жніўня). Пл.

АРКТЫКА

27 млн. км$^2$ (часам мяжой А. лічаць лінію Паўн. палярнага круга, тады пл. А. 21 млн. км$^2$). У Паўн. Амерыцы найб. плошчы займаюць невысокія (выш. 400—700 м) узгоркавыя пласкагор'і (Арктычнае плато і інш.). Самыя высокія горы на У Грэнландыі (3700 м, г. Гунб'ёрн), Бафінавай Зямлі і в-ве Элсміра. У рэльефе сушы Еўразіі пераважаюць раўніны. Месцамі ўчасткі гор (горы Быранга на п-ве Таймыр). Многія астравы ўкрыты ледавікамі; пл. ледавікоў А. 2 млн. км$^2$. Карысныя выкапні: каменны і буры вугаль, лігніт, каменная соль, руды каляровых металаў. У мацерыковай ч. многа рэк, якія замярзаюць на 8—10 месяцаў, невял. азёры (воз. Таймыр). У Паўн. Ледавітым ак. вылучаюць шэльф (глыб. 200—300 м), заняты ўскраіннымі морамі (Бафіна, Бофарта, Чукоцкім, Усх.-Сібірскім, Лаптевых, Карскім, Баранцавым, Грэнландскім) і а-вамі мацерыковага паходжання (Канадскі Арктычны Архіпелаг, Новасібірскія а-вы, Паўн. Зямля, Новая Зямля, Зямля Францa-Іосіфа, архіпелаг Шпіцберген і інш.), і дно — глыбакаводную частку, абмежаваную з Пд краем шэльфа Еўразіі і Паўн. Амерыкі. Пл. каля 5,3 млн. км$^2$, найб. глыб. 5527 м (упадзіна Літке). Падводныя хр. Ламаносава, Гакеля і Мендзялеева падзяляюць дно на падводныя катлавіны Канадскую, Макарава, Амундсена, Нансена і інш. Працяглая палярная ноч, нізкія значэнні радыяц. балансу (пры адмоўных сярэдніх т-рах студз. ад -30 да -34 °С, ліп. каля 0 °С), фарміраванне *Арктычнага антыцыклону*, інтэнсіўная цыкланічная дзейнасць спрыяюць існаванню дрэйфуючага ледавіковага покрыва шматгадовых (пакавых) ільдоў. Ледавітасць марскіх акваторый А. каля 11 млн. км$^2$ зімой і каля 8 млн. км$^2$ летам. Цыркуляцыя водаў і льдоў вызначаецца водаабменам з Атлантычным і Ціхім акіянамі. Салёнасць 30—32‰. Скорасць дрэйфу лёду і пастаянных цячэнняў 2—4 км за суткі. Панаванне арктычных паветраных масаў, *арктычнага клімату*, наяўнасць шматгадовай мерзлаты абумовілі існаванне ландшафтаў ледзяных пустыняў, хмызняковай тундры (карлікавая бяроза, вярба, багун) і *арктычных пустыняў зоны* на прымітыўных арктычных глебах. Жывёльны свет: белы мядзведзь, пясец, паўн. алень, аўцабык; з птушак — белая сава, тундравая курапатка, рагаты жаваранак, «птушыныя кірмашы» (гагі, гусі, казаркі, тундравы лебедзь). У водах А. 70 відаў фітапланктону і каля 80 розных формаў зоапланктону. У морах — маржы і цюлені. Прамысловыя рыбы: селядзец, траска, пікша, марскі акунь і інш.

У 1937 у раёне полюса была арганізавана першая сав. дрэйфуючая ст. «Паўночны полюс» пад кіраўніцтвам І.Дз.Папаніна. Вялікая роля ў асваенні А. належыць Паўн. марскому шляху. У сучасным міжнар. праве замацаваны падзел А. на 5 сектараў у адпаведнасці з паўн. граніцамі Расіі, ЗША (Аляска), Канады, Даніі (Грэнландыя) і Нарвегіі, бакавыя межы — мерыдыяны, вяршыня — Паўн. полюс. Усе землі і астравы ў межах кожнага сектара ўваходзяць у склад тэр. прылеглых дзяржаў.

*Літ.:* Арикайнен Л.И. Сквозь льды Арктики. М., 1982; Яго ж. Во льдах Североамериканской Арктики. Л., 1989.

*В.Ю.Панасюк.*

**АРКТЫ́ЧНАЕ ПАВЕ́ТРА**, паветраныя масы, якія фарміруюцца над Арктыкай.

Да арт. **Арктыка.** Белая сава.

Да арт. **Арктыка.** Статак маржоў у Чукоцкім моры.

Характарызуюцца нізкімі т-рамі (да -55 ... -60 °С), малой колькасцю вільгаці і значнай празрыстасцю. Пранікае далёка на Пд (да Сярэдняй Азіі, Міжземнамор'я і паўд. раёнаў ЗША) і прыносіць рэзкія пахаладанні ў любую пару года. Адрозніваюць марское А.п., што ў Еўропу прыходзіць праз незамярзаючыя Нарвежскае і ч. Баранцава м., і кантынентальнае, якое праходзіць над Карскім і ўсх. ч. Баранцавага мора. А.п. ў атмасферы над Беларуссю бывае ў сярэднім 40—70 сут за год, з ім звязаны веснавыя і асеннія замаразкі.

**АРКТЫ́ЧНАЯ НІЗІ́НА**, на Пн Аляскі, у ЗША. Даўж. каля 1000 км, шыр. да 150 км. Выш. каля 200 м. Складзена з марскіх алювіяльных адкладаў. Паверхня плоская, слаба расчлянёная далінамі. Характэрны поліганальныя грунты, маразабойнатрэшчынаватая шматгадовая мерзлата, гідралакаліты (узгоркі-пінга). Шматлікія лагунныя і тэрмакарставыя азёры і непраходныя балоты. Клімат субарктычны. Расліннасць мохава-лішайнікавая, па далінах рэк вярбовыя хмызнякі і асакова-разнатраўныя лугі. Радовішчы нафты і прыроднага газу (зал. Прадха). Рэдкія паселішчы эскімосаў.

**АРКТЫ́ЧНЫ АНТЫЦЫКЛО́Н**, вобласць павышанага атм. ціску над Арктыкай. У цэнтры А.а. ціск перавышае 1020 мб. Больш выразны зімой, калі ў час палярнай ночы халоднае паветра ўшчыльняецца над укрытай лёдам і снегам паверхняй. Пераважае ўстойлівае бязвоблачнае сухое надвор'е. Пад уплывам цыкланічнай дзейнасці ў Атлантычным сектары Арктыкі А.а. перамяшчаецца ў бок Аляскі. Летнія ўмовы аслабляюць антыцыклон. На выш. 3—4 км саступае месца каляпалярнай дэпрэсіі (вобласці нізкага ціску). Вятры з А.а. накіраваны ў нізкія шыроты, дзе пад уплывам вярчэння Зямлі набываюць ПнЗ напрамак.

**АРКТЫ́ЧНЫ КЛІ́МАТ**, клімат палярных раёнаў Паўн. паўшар'я (Арктыкі). Адметны доўгай марознай зімой (сярэдняя т-ра студз. ад -2 °С да -25 °С) з палярнай ноччу, кароткім халодным летам (сярэднямесячная т-ра ліп. ад -1 °С да 3—10 °С), 100—400 мм ападкаў за год. Надвор'е вызначаецца *Арктычным антыцыклонам* у цэнтр. частцы Арктыкі і цыклонамі *Арктычнага фронту* на перыферыі. Характарызуецца адмоўным радыяц. балансам зімой і вял. прытокам сонечнай радыяцыі летам. Паўд. мяжа зоны А.к. прыкладна супадае з ізатэрмай самага цёплага месяца 10 °С.

**АРКТЫ́ЧНЫ ПО́ЯС**, самы паўночны геаграфічны пояс Зямлі, які ўключае большую частку Арктыкі. Мяжу А.п. звычайна праводзяць па ізатэрме 5 °С самага цёплага месяца (ліп. ці жніўня). Характарызуецца працяглай палярнай ноччу (145 сутак), малым радыяцыйным балансам, фарміраваннем ва ўнутр. раёнах *арктычнага антыцыклону*, панаваннем *арктычнага паветра, арктычным кліматам*. Пераважаюць ландшаф-

ты *ледзяных пустыняў* і *арктычных пустыняў зоны* (на сушы) з разрэджанай травяністай расліннасцю на прымітыўных арктычных глебах. *З.Я.Андрыеўская.*

**АРКТЫ́ЧНЫ ФРОНТ**, лінія падзелу паміж *арктычным паветрам* і паветрам умераных шырот (*палярным паветрам*), паўд. мяжа арктычнай паветранай масы. Фарміруецца ў Арктыцы на Пн ад Еўропы і Паўн. Амерыкі паміж 60° і 75° паўн. ш. У залежнасці ад напрамку руху А.ф. на адным з участкаў можа быць цёплым, на другім халодным, з ім звязана інтэнсіўная цыкланічная дзейнасць. На тэр. Беларусі прыходзіць з ПнЗ (з Атлантычнага сектара Арктыкі), радзей — з Пн і ПнУ. На клімат Беларусі найб. уплываюць халодныя ўчасткі А.ф., якія выклікаюць ападкі, паўн. вятры, паніжэнне т-ры паветра, зімой — мяцеліцы. За год пад уплывам халоднага А.ф. ў сярэднім бывае 21—24 дні.

**АРКТЫ́ЧНЫХ ПУСТЫ́НЯЎ ЗО́НА**, самая паўночная прыродная зона сушы ў межах *арктычнага пояса*. Ахоплівае б.ч. Грэнландыі і а-воў Паўн. Ледавітага ак. Клімат арктычны. Пераважаюць ландшафты ледзяных і халодных камяністых пустыняў з вельмі разрэджанай лішайнікавай і нізкаслай травяністай расліннасцю (каменяломнік, снежны казялец, палярны мак і інш.). Жывёльны свет: белы мядзведзь, пясцы, лемінгі, мускусны бык. На прыбярэжных скалах птушыныя кірмашы (кайры, чысцікі, гагары і інш.).

*З.Я.Андрыеўская.*

**А́РКУШ** (польскае arkusz), 1) стандартны кавалак паперы, кардону, фанеры і інш. 2) Адзінка вымярэння ў паліграфіі і выдавецкай справе. Адрозніваюць А. аўтарскі, улікова-выдавецкі, папяровы друкаваны і ўмоўна-друкаваны.

Аўтарскім А. вымяраюць аб'ём літ. твора (рукапіснага і надрукаванага). У бел. паліграфіі роўны 40 тыс. друкаваных знакаў (з прагаламі паміж словамі), ці 700 вершаваным радкам, ці 3 тыс. см² надрукаванага ілюстрацыйнага матэрыялу. Улікова-выдавецкі А. — аб'ём друкаванага твора, колькасцю знакаў роўны аўтарскаму, але акрамя аўтарскага тэксту ўключае тытул, рэдакцыйную прадмову, змест, рэкламу, калонтытулы і інш. тэкставы і графічны матэрыял. Служыць для выдавецкага планавання, вызначэння кошту выдання і інш. Папяровым А. вызначаюць колькасць выкарыстанай на выданне паперы. Друкаваны А. паказвае аб'ём (плошчу) выдання і раўняецца палове папяровага пры стандартных фарматах. Умоўны друкаваны А. — адзінка ўліку выдавецкай прадукцыі: папяровы А. фармату 60 х 90 см, надрукаваны з аднаго боку. Аб'ём выданняў, надрукаваных на паперы інш. фарматаў, для параўнання паказчыкаў пералічваюць ва ўмоўныя друкаваныя аркушы.

**А́РКУШ** Алесь (сапр. Козік Аляксандр Барысавіч; н. 28.5.1960, г. Жодзіна Мінскай вобл.), бел. пісьменнік, выдавец. Скончыў Бел. ін-т нар. гаспадаркі (1987). Уваходзіў у літ. аб'яднанне *«Тутэйшыя»*. Стваральнік Т-ва вольных літаратараў (1993). Заснаваў выдавецкую суполку «Полацкае ляда», выдае літ. альманах «Ксэракс беларускі», серыю «Паэзія новай генерацыі». У яго вершах (зб-кі «Вяртанне», 1988; «Тайніца», 1991, з П.Бурдыкам; «Крылы ператвораца ў карэнні», 1993; «Развітанне з Танталам», 1994) інтэлектуальная заглыбленасць, псіхалагізм, матывы міфалогіі.

**АРЛА́Н-БЕЛАХВО́СТ** (Haliaeetus albicilla), птушка сямейства ястрабіных атр. сокалападобных. Пашыраны ў Еўразіі, Паўн. Афрыцы. На Беларусі надзвычай рэдкі гнездавальны від, вядома каля 20 пар, якія гняздуюцца, з іх палова ў Віцебскай вобл. Трапляецца спарадычна. Жыве каля вял. азёраў, у далінах рэк, на вял. балотах. Занесены ў Чырв. кнігу Беларусі.

Даўж. цела 0,8—1 м, маса да 6,5 кг, размах крылаў да 2,5 м. Апярэнне цёмна-бурае. Хвост у дарослых белы (адсюль назва), кароткі, клінападобны. Дзюба і лапы жоўтыя. Прылятае ў сак.—красавіку. Гнёзды масіўныя, на верхавінах высокіх (15—25 м) дрэў. Утварае пастаянныя пары. Нясе звычайна 2 (радзей 1, 3) белыя яйцы. Птушаняты выляжваюць у канцы чэрв. — пач. жніўня. Здабыча на Беларусі забаронена з 1978. Ахоўваецца ў шэрагу краін.

Арлан-белахвост.

**АРЛЕА́Н** (Orléans), горад у цэнтр. частцы Францыі, на р. Луара. Адм. ц. дэпартамента Луара і гал. горад гіст. вобласці Арлеанэ. 105,5 тыс. ж. (1982). Буйны трансп. вузел. С.-г., эл.-тэхн. машынабудаванне. Харч. цэнтр гародніна-садавіннага рэгіёна, харчасмакавая (вытв-сць вінаў), тэкст., фармацэўтычная прам-сць. Ун-т. Музеі (у т.л. *Жанны д'Арк*).

У старажытнасці быў гал. горадам (наз. Цэнабум) кельцкага племя карнутаў. У 1 ст. да н.э. разбураны Цэзарам, адноўлены ў 3 ст. рым. імператарам Аўрэліянам (адсюль назва Аўрэліянум, А.). У 6—7 ст. цэнтр Арлеанскага каралеўства. У 12 ст. буйны гандл. цэнтр з частковым самакіраваннем. У 1309 засн. ун-т. У *Стогадовую вайну 1337—1453* А. пасля 7-месячнай аблогі англічан у маі 1429 вызвалены франц. войскамі на чале з *Жаннай д'Арк*. У перыяд рэлігійных войнаў 16 ст. адзін з цэнтраў гугенотаў. У 1560 у А. скліканы Ген. штаты. У 1870 яго двойчы займалі прускія войскі. Горад захаваў аблічча 18 ст., ёсць помнікі архітэктуры 10—18 ст. (гатычны сабор Сент-Круа, з 13 ст.; царква Сент-Эверт; рэнесансавая царква Нотр-Дамдэ-Рэкуўранс, 1513—19; класіцыстычныя, барочныя збудаванні і інш.).

**АРЛЕАНВІ́ЛЬ** (Orléansville), былая назва алжырскага г. *Эш-Шэліф*.

**АРЛЕАНІ́СТЫ**, манархічная групоўка ў Францыі ў 19 ст. Узвяла на трон у 1830 Луі Філіпа Арлеанскага. У перыяд яго праўлення [1830—48] панавалі ў Францыі, у перыяд *Другой рэспублікі* [1848—52] уваходзілі ў «партыю парадку», палітыка якой садзейнічала ўстанаўленню Другой імперыі. Пасля ўдзелу ў падрыхтоўцы няўдалага манарх. перавароту ў 1870-я г., а затым у *буланжызме* (канец 1880-х г.) сышлі з паліт. арэны.

**АРЛЕА́НСКАЯ ДЗЕ́ВА**, гл. *Жанна д'Арк*.

**АРЛЕА́НСКІ ДОМ**, гл. ў арт. *Бурбоны*.

**АРЛЕАНЭ́** (Orléanais), гістарычная правінцыя ў Францыі. Уключае дэпартамент Луара, часткова Луар і Шэр, Эр і Луар, Йёна, Эсон. Пл. 17,7 тыс. км². Нас. каля 1,1 млн. чал. (1982). Гал. горад Арлеан.

**АРЛЕ́ЙКА**, возера ў Беларусі, у Гарадоцкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Лужаснянка. За 24 км на У ад г. Гарадок. Пл. 0,41 км², даўж. 1,01 км, найб. шыр. 0,75 км, найб. глыб. 2,9 м. Пл. вадазбору каля 24 км². Даўж. берагавой лініі 4 км. Берагі пясчаныя, зараслі хмызняком. Дно выслана сапрапелем, уздоўж берагоў пяском. Схілы катлавіны выш. 2—4 м, разараныя. Упадае ручай з воз. Плаў, сцёк у воз. Вымна. Гнездаванне рэдкай птушкі — гогаля звычайнага.

**АРЛЕКІ́Н** (італьян. Arlecchino), традыцыйны персанаж італьянскай *камедыі дэль артэ*; слуга-прастак, нязграбны цялпук, які сваімі недарэчнымі паводзінамі заблытваў інтрыгу камедыі. У сярэдзіне 17 ст. ў Францыі — вобраз хітрага, дасціпнага плеткара, які актыўна ўдзельнічаў у развіцці дзеяння. Далейшая змена маскі А. адбывалася па-за камедыяй дэль артэ. У 18 — пач. 19 ст. ў Францыі А. — вытанчаны любоўнік, нічаслівы сапернік персанажа нар. т-ра П'еро.

**АРЛЕ́НЕЎ** (сапр. Арлоў) Павел Мікалаевіч (6.3.1869, Масква — 31.8.1932), рускі акцёр. Нар. арт. Рэспублікі (1926). Сцэн. дзейнасць пачаў у 1886. Выступаў як акцёр-гастралёр у розных гарадах Расіі, Беларусі і інш. У творчасці дамінаваў герой, душэўна неўладкаваны, сумленны, які імкнецца, але не можа спалучыць свае ідэалы з рэальнымі ўмовамі быцця. Лепшыя ролі: цар Фёдар Іаанавіч (аднайм. п'еса А.К.Талстога), Раскольнікаў і Дзмітрый Карамазаў («Злачынства і кара», «Браты Карамазавы» паводле Ф.Дастаеўскага), Освальд («Здані» Г.Ібсена).

**АРЛЕ́Я**, возера ў Беларусі, у Полацкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Сасніца. За 43 км на ПнУ ад Полацка. Пл. 0,65 км$^2$, даўж. 2,33 км, найб. шыр. 0,43 км, найб. глыб. 2,7 м. Пл. вадазбору 12,3 км$^2$. Даўж. берагавой лініі 6,2 км. Берагі нізкія, на З сплавінныя. Дно плоскае, выслана сапрапелем, каля ўсх. берага — апясчаненым глеем. Схілы катлавіны выш. 2 м, на ПнЗ — да 15 м, парослыя хмызняком і разараныя. Упадаюць 3 ручаі, выцякае р. Дражбітка.

**АРЛІ́**, Арліт (Arlit), буйны уранавы радовішча ў Нігеры. Радовішчы уранзмяшчальных пясчанікаў, якія залягаюць на глыб. 40—50 м у каменнавугальных, юрскіх і мелавых кантынентальных адкладах чахла Афрыканскай платформы. Агульныя запасы урану ацэньваюцца ў 250 тыс. т (1978). Сярэдняя колькасць металу ў рудзе 0,2—0,4%. Радовішчы распрацоўваюцца з 1970 адкрытым і падземным спосабамі. Цэнтр — г. Арліт.

**АРЛО́ВА** Галіна Аляксандраўна (н. 30.11.1928, Віцебск), бел. актрыса. Нар. арт. Беларусі (1991). У 1948 скончыла студыю пры т-ры імя Я.Коласа, у якім і працавала. З 1959 у т-ры імя Я.Купалы. Выканаўца характарных і драм. роляў: Маланка («Машэка» В.Вольскага), Ягадка («Амністыя» М.Матукоўскага), Кудрыцкая («Брама неўміручасці» К.Крапівы), Грыпіна («Ажаніцца — не журыцца» Далецкіх і М.Чарота), Зуйчыха («Страсці па Аўдзею» І.Бутрамеева), Алена («Жаніцьба Бялугіна» А.Астроўскага), Нэлі («Прыніжаныя і зняважаныя» паводле Ф.Дастаеўскага). Дзярж. прэмія Беларусі 1989 (за ролі ў радыёспектаклях «Хамуціус» паводле А.Кулешова і «Рыбакова хата» паводле Я.Коласа).

**АРЛО́ВА** Любоў Пятроўна (11.2.1902, г. Звянігарад — 26.1.1975), руская актрыса. Нар. арт. СССР (1950). Вучылася ў кансерваторыі (1919—22), тэатр. тэхнікуме (1922—25) у Маскве. У 1926—33 артыстка муз. т-ра імя У.І.Неміровіча-Данчанкі. З 1955 у т-ры імя Массавета. Здымалася ў кіно: Анюта («Вясёлыя хлопцы»), Марыён Дыксан («Цырк»), Дуня («Волга-Волга»), прафесар Нікіціна і актрыса Шатрова («Вясна»); сярод роляў у тэатры: Нора («Нора» Г.Ібсена), Патрык Кэмпбэл («Мілы лгун» Дж.Кілці). Дзярж. прэміі СССР 1941, 1950.

**АРЛО́ВА** Таццяна Дзмітрыеўна (н. 28.7.1935, Масква), бел. тэатразнавец. Канд. мастацтвазнаўства (1969). Скончыла БДУ (1959). Выкладчык БДУ (з 1972). Даследуе пытанні сучаснага бел. тэатр. мастацтва. Аўтар манаграфіі «Ты і я» (1969) пра надзённыя праблемы т-ра, эцюдаў пра акцёраў «Купалаўцы» (1985), праблемных артыкулаў, творчых партрэтаў майстроў бел. тэатра, радыёцыкла пра гісторыю і сённяшні дзень бел. тэатра.

**АРЛО́ВІЧ** Валянцін Антонавіч (н. 2.1.1947, в. Краснае Маладзечанскага р-на Мінскай вобл.), бел. фізік. Д-р фізіка-матэм. н. (1990), праф. (1992). Скончыў БДУ (1969). З 1969 у Ін-це фізікі АН Беларусі. Распрацаваў новыя метады кагерэнтнай спектраскапіі камбінацыйнага рассеяння святла, да-

Да арт. Арлекін. П. Сезан. П'еро і Арлекін. 1888.

следаваў уплыў квантавых шумаў на нелінейна-аптычныя працэсы, стварыў высокаэфектыўныя цвердацельныя і газавыя лазеры.

**АРЛО́ВІЧЫ**, вёска ў Беларусі, у Дуброўенскім р-не Віцебскай вобл., на р. Дняпро. Цэнтр Валяўкоўскага с/с і саўгаса «Арловічы». За 36 км ад Дуброўна, 143 км ад Віцебска, 44 км ад чыг. ст. Асінаўка. 352 ж., 128 двароў (1995). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, камбінат.быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў. Парк пейзажнага тыпу 19—20 ст. — помнік садова-паркавага мастацтва.

**АРЛО́Ў** Алег Рыгоравіч (18.7.1934, в. Старасакольнікі Новасакольніцкага р-на Пскоўскай вобл. — 22.4.1995), бел. жывапісец, педагог. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1966). З 1966 выкладаў у Віцебскім пед. ін-це. Працаваў у жанры тэматычнай карціны, пейзажа, партрэта. Творам уласцівы эмацыянальная выразнасць, экспрэсіўнасць, імпрэсіяністычная сакавітасць фарбаў: «Разбураны горад» (1960), «Пейзаж у Лескавічах», «Лучоса», «Каток у Віцебску», аўтапартрэт (усе 1970), «Раніца ў Дуброўне», «Стары замак», партрэты мастакоў А.Салаўёва і А.Мемуса (усе

Г.А.Арлова.

1980), «Зіма ў Здраўнёве» (1985), «Плошча Перамогі» (1990), «Рыга», «Стары Полацк», «Старая Беліца» (усе 1993). *М.Л.Цыбульскі.*

**АРЛО́Ў** Аляксандр Іванавіч (30.8.1873, С.-Пецярбург — 10.10.1948), рус. і ўкр. дырыжор. Нар. арт. Расіі (1945). Праф. (1927). З 1912 сімф. і оперны дырыжор, у т.л. аркестра С.*Кусявіцкага*, Кіеўскай укр. оперы (1925—29). З 1930 дырыжор Вял. сімф. аркестра Усесаюзнага радыё. Муз. кіраўнік пастановак многіх опер, у т.л. «Турандот» Дж. Пучыні і «Каралі Мадонны» Э.Вольфа-Ферары.

**АРЛО́Ў** Аляксандр Мікалаевіч (1908, Віцебск — 1942), бел. скульптар. Скончыў Віцебскі маст. тэхнікум (1929). Чл. Віцебскага філіяла Аб'яднання моладзі Асацыяцыі мастакоў рэвалюцыі (1928—30). Удзельнічаў у скульпт. афармленні Дома ўрада (1933), Акруговага Дома афіцэраў (1935), Палаца піянераў (1936; усе ў Мінску), бел. павільёна на Усесаюзнай с.-г. выстаўцы ў Маскве (1939). Загінуў у фаш. канцлагеры.

**АРЛО́Ў** Аляксей Рыгоравіч (5.10.1737, с. Любліна Цвярской вобл. — 5.1.1808), расійскі дзярж. і ваенны дзеяч. Ген.-аншэф (1769), граф (1762). Брат Р.Р.*Арлова*. Адзін з гал. удзельнікаў дварцовага пераварота 1762, у выніку якога прастол заняла Кацярына II. У званні сяржанта атрымаў чын ген.-маёра (1762), аказваў вял. ўплыў на дзярж. справы. З 1769 камандаваў рас. эскадрай у Міжземным моры. За перамогі над турэцкім флотам каля Наварына і ў *Чэсменскім баі 1770* атрымаў тытул Чэсменскага. З 1775 у адстаўцы. У маёнтках А. выведзена *арлоўская рысістая парода* верхавых коней.

**АРЛО́Ў** Георгій Міхайлавіч (8.4.1901, Курск — 16.4.1985), рускі архітэктар. Нар. арх. СССР (1970), правадз. член

АМ СССР (з 1979). Вучыўся ў Маскоўскім вышэйшым тэхн. вучылішчы (1921—26). Праф. Маскоўскага арх. ін-та (з 1969); 1-ы сакратар праўлення Саюза архітэктараў СССР (1963—81). Адзін з аўтараў праекта Днепрагэса (1927—32) і яго аднаўлення ў 1944—50, гал. архітэктар Кахоўскай (1951—55), Крамянчугскай (1955) і Брацкай

Дз.А.Арлоў.

У.А.Арлоў.

(1960—67) ГЭС. Дзярж. прэмія СССР 1951, Дзярж. прэмія Расіі 1969.

**АРЛО́Ў** Дзмітрый Аляксеевіч (26.9.1903, Масква — 18.6.1969), акцёр, рэжысёр. Нар. арт. Беларусі (1940). Праф. (1961). Скончыў Дзярж. ін-т тэатр. мастацтва ў Маскве (1925). У 1936—51 акцёр і рэжысёр Дзярж. рус. драм. т-ра Беларусі. У 1948—69 выкладаў у Бел. тэатр.-маст. ін-це. Акцёр шырокага творчага дыяпазону, дасканалага прафес. майстэрства: Хлестакоў («Рэвізор» М.Гогаля), цар Фёдар Іаанавіч (аднайм. п'еса А.К.Талстога), Мальволіо («Дванаццатая ноч» У.Шэкспіра), Чайка («Што пасееш, тое і пажнеш» В.Палескага). Пастаноўкі А. вызначаліся тэатр. культурай, раскрыццём аўтарскай задумы твора: «Дзядзя Ваня» А.Чэхава (1949), «Шалёныя грошы» А.Астроўскага (1961) і інш. Здымаўся ў кіно («Гадзіннік спыніўся апоўначы», «Веснавыя навальніцы» і інш.).

*Літ.:* Вішкароў Б. Акцёр, рэжысёр, педагог (Дз.А.Арлоў) // Майстры беларускай сцэны. Мн., 1960; Бурьян Б., Лисневский И. На театральных перакрёстках. Мн., 1967.

**АРЛО́Ў** Дзмітрый Мікалаевіч (20.5.1892, г. Спаск-Разанскі, Расія — 19.12.1955), рускі акцёр. Нар. арт. Расіі (1943). Скончыў тэатр. школу П.І.Ільіна (1918, Харкаў). У 1922—44 у Маскоўскім т-ры Рэвалюцыі, з 1944 у МХАТ. Вострахарактарны акцёр. Яго мастацтва адметнае шчырасцю, мяккім гумарам і гратэскавай сатырычнасцю. Сярод роляў: Юсаў («Даходнае месца» А.Астроўскага), Глоба («Рускія людзі» К.Сіманава), Трыстан («Сабака на сене» Лопэ дэ Вэгі). Дзярж. прэмія СССР 1947.

**АРЛО́Ў** Іван Аляксеевіч (10.11.1902, г. Віцебск — 2.9.1980), ваен. дзеяч, ген.-лейтэнант (1944). У Чырв. Арміі з 1922. Скончыў Ваенна-паліт. акадэмію (1936), быў нач. палітаддзела акадэміі, нач. аддзела Палітупраўлення РСЧА, нач. Вышэйшых курсаў палітсаставу. У Вял. Айч. вайну з 1941 ваенком знішчальнага авіякорпуса, чл. Ваен. савета ППА краіны, Зах., Паўн., Цэнтр. франтоў ППА. Удзельнік абароны Масквы, Сталінграда, Ленінграда. Да 1953 у цэнтр. апараце Мін-ва абароны СССР.

**АРЛО́Ў** Леў Мікалаевіч (н. 2.1.1940, Варонеж), бел. фізік. Д-р фізіка-матэм. н. (1987), праф. (1989). Скончыў БДУ (1961). З 1965 у Ін-це фізікі АН Беларусі. Навук. працы па фіз. электроніцы, лазернай фізіцы і лазерным прыладабудаванні. Правёў даследаванні механізмаў і цеплавых рэжымаў генерацыі розных тыпаў лазераў, эфекту палярызацыйна-частотнай неўзаемнасці ў кальцавых лазерах.

С.Арлоў, А.Антропаў, М.Штам. Помнік Юрыю Далгарукаму ў Маскве. 1954.

*Тв.:* Тепловые эфекты в газовых лазерах. Т. 1. Активные среды газоразрядных лазеров. Мн., 1992.

**АРЛО́Ў** Рыгор Рыгоравіч (17.10.1734 — 24.4.1783), расійскі дзярж. і ваен. дзеяч. Граф (1762). Брат А.Р.*Арлова*. Удзельнік *Сямігадовай вайны 1756—63*, дварцовага пераваротy 1762, у выніку якога прастол заняла Кацярына II. У 1763—75 ген.-фельдцэйхмайстар рус. арміі. У 1771 кіраваў задушэннем «чумнага бунту» ў Маскве. У 1772 узначальваў рус. дэлегацыю на перагаворах з Турцыяй. Ініцыятар заснавання Вольнага эканам. т-ва (1765) і яго першы прэзідэнт. З 1775 у адстаўцы.

**АРЛО́Ў** Сяргей Міхайлавіч (14.9.1911, С.-Пецярбург — 18.11.1971), рускі скульптар. Нар. мастак РСФСР (1968). Чл.-кар. АМ СССР (1954). Скончыў Валагодскі маст. тэхнікум (1925). Аўтар кампазіцый з фарфору на гераіка-эпічныя тэмы, матывы рас. гісторыі і нар. казак. Асн. творы ў галіне манум. скульптуры: «Маці» (1943), «Аляксандр Неўскі» (1943—44), «Казка пра рыбака і рыбку» (1944; усе тры Дзярж. прэмія СССР 1946), помнік Юрыю Далгарукаму ў Маскве (1954, разам з А.Антропавым і інш.), Афанасію Нікіціну ў г. Цвер (1955).

**АРЛО́Ў** Сяргей Сяргеевіч (22.8.1921, в. Мегра Валагодскай вобл. — 7.10.1977), рускі паэт. Скончыў Літ. ін-т імя Горкага (1954). У 1941—44 ваяваў на фронце. Першыя кнігі вершаў «Трэцяя хуткасць» (1946) і «Паход працягваецца» (1948) прысвяціў Айч. вайне. У зб-ках вершаў «Памяць сэрца» (1960), «Адданасць» (1973), «Кастры» (1978), паэмах «Песня Ленінграду» (1957), «Слова пра Цыялкоўскага» (1962), «На вастрыі стралы барвовай» (1980) і інш. філас. і лірычныя разважанні пра час, лёс пакалення, будучыню роднай зямлі. Своеасаблівасць яго вершаў у непасрэднасці, пранікнёнасці паэт. інтанацый.

*Тв.:* Собр. соч. Т. 1—3. М., 1979—80.

*С.Н.Чубакоў.*

**АРЛО́Ў** Уладзімір Аляксеевіч (н. 25.8.1953, г. Полацк), бел. пісьменнік. Скончыў БДУ (1975). З 1988 у выд-ве «Мастацкая літаратура». З 1989 віцэ-прэзідэнт Бел. ПЭН-клуба. Друкуецца з 1976. Дэбютаваў вершамі. У прозе распрацоўвае гіст. тэматыку: «Добры дзень, мая Шыпшына» (1986, Прэмія Ленінскага камсамола Беларусі 1986), «Дзень, калі ўпала страла» (1988), «Асветніца з роду Усяслава: Ефрасіння Полацкая» (1989), «Рандэву на манеўрах», «Ефрасіння Полацкая», «Прысуд выканаў невядомы: Ігнат Грынявіцкі» (усе 1992), «Міласць князя Гераніма» (1993), «Пяць мужчын у леснічоўцы», «Таямніцы полацкай гісторыі» (абедзве 1994). Героі яго твораў — патрыёты роднай зямлі, славутыя людзі Беларусі, якія памнажалі яе славу і гонар, не шкадавалі свайго жыцця дзеля шчасця Бацькаўшчыны. Аўтар зб. вершаў у прозе «Там, за дзвярыма» (1991), кн. літ.-публіцыст. артыкулаў і эсэ «Совершенно секретно», або Адзін у трох іпастасях» (1992), «Мой радавод да пятага калена» (1993). Перакладае з рус., укр., фінскай моў.

*І.У.Саламевіч.*

**АРЛО́Ў** Юрый Аляксандравіч (12.6.1893, с.Тамышава Наваспаскага р-на Ульянаўскай вобл., Расія — 2.10.1966), сав. палеантолаг і гістолаг. Акад. АН СССР (1960; чл.-кар. 1953). Скончыў Петраградскі ун-т (1917). Праф. Ленінградскага (1933—41), Ма-

скоўскага (з 1939) ун-таў; адначасова з 1932 у Палеанталагічным ін-це АН СССР (з 1945 дырэктар). Навук. працы па параўнальнай марфалогіі і палеанеўралогіі выкапнёвых пазваночных, нейрагісталогіі сучасных беспазваночных. Рэдактар «Палеонтологического журнала» (1959—66) і гал. рэдактар 15-томнай працы «Асновы палеанталогіі». Ленінская прэмія 1967.

**АРЛО́ЎСКАЯ ВО́БЛАСЦЬ**, у складзе Расіі. Утворана 27.9.1937. Пл. 24,7 тыс. км². Нас. 911,6 тыс. чал. (1994), гарадскога 62%. Цэнтр — г. *Арол*. Найб. гарады: Болхаў, Ліўны, Мцэнск.

**Прырода**. Вобласць размешчана ў цэнтр. частцы Усх.-Еўрапейскай раўніны, у межах Сярэднярускага ўзвышша. Паверхня — узгоркавая раўніна (пераважныя выш. 220—250 м, найб. 278 м), парэзаная далінамі рэк, ярамі і лагчынамі. Карысныя выкапні: жал. руда, буд. матэрыялы (вапнякі, гліны, пяскі, мергелі, мел), буры вугаль, фасфарыты. Клімат умерана кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. -9°С, ліп. 18 °С, ападкаў 570—580 мм за год. Рэкі: Ака (з прытокамі Зуша, Неруч, Цон і інш.), на ПдУ р. Сасна (з прытокамі Цім, Кшэнь), на ПдЗ — Наўля і Няруса (прытокі Дзясны). Пераважаюць вышчалачаныя чарназёмы, на ПнЗ шэрыя лясныя і дзярнова-падзолістыя глебы. Мяшаныя лясы (бяроза, дуб, асіна, клён, ясень, хвоя і елка) з хмызнякамі займаюць каля 8% плошчы. Стэп узараны, захаваліся невял. ўчасткі. Па далінах рэк заліўныя лугі.

**Гаспадарка**. Асноўныя галіны вытв-сці: машынабудаванне (тэхнал. абсталяванне для тэкст., гарбарна-абутковай, шкляной, харч. прам-сці, аўтагрэйдэры, аўтапагрузчыкі, цэнтрабежныя помпы, прылады, выліч. машыны, гадзіннікі, радыёдэталі і інш.), металургія (вытв-сць стальнога пракату), хім. (пластмасы, гумаватэхн. вырабы), мікрабіял., лёгкая (абутковая, швейная і трыкат.), харч. (цукровая, мясная, масла- і сыраробная, крухмала-патачная, спіртава-гарэлачная і інш.) прам-сць. Вытв-сць буд. матэрыялаў (цэгла, шкло і інш.). Пасевы збожжавых: пшаніцы, жыта, аўса і ячменю. Вырошчваюць грэчку, пукр. буракі, каноплі, зернебабовыя і кармавыя культуры. Развіты бульбаводства, агародніцтва, садоўніцтва. Малочна-мясная жывёлагадоўля, мяса-сальнае свінаводства, мяса-воўнавая авечкагадоўля, птушкагадоўля. Племянная конегадоўля (арлоўскія рысакі). Па тэр. вобласці праходзяць чыгункі Масква—Курск, Бранск—Арол—Ліпецк, аўтадарогі Масква—Арол—Сімферопаль, Арол—Бранск—Смаленск; нафтаправод «Дружба».

*П.Г.Рогач.*

**АРЛО́ЎСКАЯ РЫСІ́СТАЯ ПАРО́ДА лёгказапражных коней.** Выведзена ў канцы 18 — пач. 20 ст. А.Р.Арловым і В.К.Шышкіным на Хрэнаўскім конным з-дзе Варонежскай губ. скрыжаваннем верхавой арабскай з запражнымі пародамі (туркменскай, дацкай, галандскай і інш.). Стымулявала развіццё конегадоўлі ў Расіі. Выкарыстоўваюць для паляпшэння пароднасці мясц. коней, у спорце, турызме. На Беларусі перспектыўная ў вывядзенні прыгожых прагулачных коней.

Коні буйныя (выш. ў карку 160—162 см),

Жарабец арлоўскай рысістай пароды.

гарманічнага целаскладу, трывалыя. Масць шэрая, вараная, гнядая. Маюць высокую рысістасць: рэкорд у конных забегах на 1600 м — 1 мін 59,7 сек.

*М.А.Гарбукоў.*

**АРЛО́ЎСКІ** (Orłowski) Аляксандр Восіпавіч (9.3.1777, Варшава — 13.3.1832), польскі і рускі жывапісец і графік. Прадстаўнік рамантызму. Акад. Пецярбургскай АМ (з 1809). Каля 1793—1802 вучыўся і працаваў у Варшаве ў Я.П.Норбліна. З 1802 у Пецярбургу. Аўтар жанравых («Сцэна ў карчме», 1795—96) і батальных («Бітва пад Рацлавіцамі», 1798 або каля 1801) твораў, партрэтаў герояў вайны 1812 (М.І.Платава, Д.Давыдава), «Аўтапартрэта», пейзажаў, малюнкаў. А. — адзін з заснавальнікаў шаржа («Ш.Л.Дзідро», каля 1810) і паліт. карыкатуры («Французскі эмігрант Дзю-Селон», 1806) у рус. графіцы. Адзін з першых пачаў працаваць у тэхніцы літаграфіі («Рамізніцкая біржа», 1820).

*Літ.:* Ацаркина Э.Н. А.О.Орловский, 1777—1832. М., 1971.

**АРЛО́ЎСКІ** (сапр. Смірноў) Барыс Іванавіч (1796, с. Сталбецкае Пакроўскага р-на Арлоўскай вобл. — 28.12.1837), рускі скульптар. Прадстаўнік класіцызму. Вучыўся ў скульпт. майстэрнях С.Кампіёні ў Маскве (з 1809) і П.Трыскорні ў Пецярбургу (з 1816), у Пецярбургскай АМ (1822), з 1836 яе прафесар. Пенсіянер АМ у Рыме (1823—28). У творах А. («Парыс», 1824, помнікі М.І.Кутузаву і М.Б.Барклаю-дэ-Толі ў Пецярбургу, 1828—37) велічная строгасць класіцыстычных формаў, часам не пазбаўленая рысаў патэтыкі, спалучаецца з рамант. прыўзнятасцю.

**АРЛО́ЎСКІ** Восіп Данілавіч (?, Віцебшчына — 1926), бел. пісьменнік. Выдаў зб. вершаваных апавяданняў і вершаваных драм. абразкоў «Беларускія народныя апавяданні» (Полацк, 1908). Сюжэты іх заснаваны пераважна на мясц. паданнях, былічках, незвычайных гісторыях, розных здарэннях. Асуджаў бытавыя і маральныя заганы ў жыцці сялян, сац. несправядлівасць, грамадскія пе-



А.Арлоўскі. Рамізніцкая біржа. 1820.

раўтварэнні і тэхн. прагрэс, ідэалізаваў прыгонныя парадкі, веру ў бога і цара.

*Літ.:* Вашко П. Загадкі Восіпа Арлоўскага // Першацвет. 1995. № 10.

**АРЛО́ЎСКІ** Канстанцін Іванавіч (15.12.1913, г. Быхаў — 22.7.1944), Герой Сав. Саюза (1945). У Чырв. Арміі з 1934. Скончыў Бабруйскае танк.

К.П.Арлоўскі.

вучылішча (1939). Удзельнік сав.-фінл. вайны 1939—40. У Вял. Айч. вайну на фронце з чэрв. 1941. Вызначыўся ў ліп. 1944 пры вызваленні Латвіі: танк. батальён пад яго камандаваннем двойчы прарываў умацаванні ворага, за 8 дзён наступлення прайшоў каля 300 км, знішчыў 12 танкаў, 8 танкетак, каля 50 гармат. Загінуў у баі.

**АРЛО́ЎСКІ** Кірыла Пракопавіч (30.1.1895, в. Мышкавічы Кіраўскага р-на Магілёўскай вобл. — 13.1.1968), адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыз. руху на Беларусі ў Вял. Айч. вайну, гасп. дзеяч. Герой Сав. Саюза (1943), Герой Сац. Працы (1958). Скончыў Камуніст. ун-т меншасцяў Захаду імя Мархлеўскага ў Маскве (1930). З 1915 у

Б.Арлоўскі. Помнік М.І. Кутузаву ў Санкт-Пецярбургу. 1837.

арміі, з 1918 у Аршанскай і Бабруйскай надзвычайнай камісіях (ЧК), камандзір атрада на Бабруйшчыне, на падп. рабоце ў Коўне. У 1922—25 камандзір партыз. атрада ў Зах. Беларусі. У 1930—36 у органах ДПУ—НКУС Беларусі. Удзельнік нац.-вызв. вайны ў Іспаніі 1936—39. У 1940—42 у Кітаі. У 1942—43 камандзір спец. атрада НКДБ СССР «Сокалы». З 1944 старшыня калгаса «Рассвет» на радзіме. Дэп. Вярх. Савета БССР у 1947—51, Вярх. Савета СССР з 1950. Імя А. прысвоена калгасу «Рассвет», у в. Мышкавічы ўстаноўлены бюст А.

*Літ.:* Ражкоў І. Чалавек з легенды. Мн., 1976.

**АРЛО́ЎСКІ** Уладзімір Данатавіч (1.2.1842, Кіеў — 19.2.1914), украінскі жывапісец-пейзажыст. У 1861—68 вучыўся ў Пецярбургскай АМ, з 1874 яе акадэмік, з 1878 прафесар. Удасканальваў майстэрства ў Францыі, Германіі,

Арлы: 1 — стэпавы; 2 — іспанскі магільнік.

Швейцарыі, Італіі. Пісаў рамант. пейзажы з эфектамі асвятлення: «Крымскі пейзаж» (1868), «У стэпе» (1874), «Сенакос», «На моры перад навальніцай» (абедзве 1878), «Зацішша» (1890) і інш.

**АРЛО́ЎСКІ** Яўстафій Філарэтавіч (26.4.1863, в. Славенск Валожынскага р-на Мінскай вобл. — 15.12.1913), гісторык, краязнавец і педагог. Скончыў Пецярбургскі гісторыка-філал. ін-т (1885), выкладаў гісторыю ў Гродзенскай гімназіі. Аўтар прац па гісторыі нас. пунктаў Гродзеншчыны, нар. адукацыі, правасл. царквы. Вывучаў ролю беларусаў у гісторыі ВКЛ. У дакладзе на 9-м археал. з'ездзе (Вільня, 1893) даказаў тоеснасць летапіснага Городеньў і сучаснага Гродна. Рабіў захады для археал. даследавання на Замкавай гары. У кн. «Гродзенская даўніна» (ч. 1, 1910) даследаваў гісторыю Гродна ад часоў заснавання да пач. 20 ст. *А.П.Госцеў.*

**АРЛЫ́** (Aquila), род птушак атр. сокалападобных. 9 відаў. Пашыраны ў Еўразіі, Афрыцы і Паўн. Амерыцы. Насяляюць гарыстыя, стэпавыя, пустынныя і лясныя мясцовасці. Ёсць рэдкія А., напр. стэпавы (А. чарах) і вельмі рэдкія, напр. іспанскі падвід А.-магільніка (A. heliaca adalberti), які ўключаны ў Чырв. кнігу МСАП. На Беларусі 5 відаў: *падворлікі* (вялікі і малы), *беркут, арол-карлік, арол-магільнік*. Найб. пашыраны малы падворлік. Іншыя трапляюцца абмежавана і ў невял. колькасці. Занесены ў Чырв. кнігу Беларусі.

Даўж. цела да 1 м, размах крылаў да 2,4 м. Апярэнне звычайна бурае. Хвост даволі кароткі. Ногі апераны да пальцаў. Гняздуюцца на зямлі, скалах ці дрэвах. Нясуць 1—3 яйцы. Кормяцца звярамі малой і сярэдняй велічыні, птушкамі, рэптыліямі, амфібіямі, зрэдку мярцвячынай. Здабычу высочваюць у палёце або падпільноўваюць, седзячы на ўзвышаным месцы. Знішчаюць шкоднікаў лясной і сельскай гаспадаркі. А. часам наз. і прадстаўнікоў інш. родаў драпежных птушак.

**АРЛЯ́К** (Pteridium), род *папарацяў* сям. ґіпалепісавых. 8 відаў. Пашыраны пераважна ў трапічных і субтрапічных абласцях, з іх А. звычайны (P. aquilinum) расце амаль па ўсім свеце, А. крымскі (P. tauricum) — у горным поясе Крыма і Каўказа. На Беларусі ўсюды ў хвойных і мяшаных лясах, на ўзлесках, высечках і гарах расце А. звычайны.

Шматтадовая споравая расліна выш. да 2 м з доўгім паўзучым разгалінаваным карэнішчам. Лісце адзіночнае, двойчы-, тройчы непарнаперыстае, скурыстае, размешчана на доўгім моцным чаранку ў адной плоскасці. Сорусы ўкрыты індузіем, пад загорнутым краем ліста. Споры тэтраэдрычныя, шарападобныя. Маладое лісце ядомае. Багатыя крухмалам (да 45%) карэнішчы маюць у сабе арлякадубільную і сінільную к-ты, выкарыстоўваюцца на корм свінням (для буйн. раг. жывёлы і коней атрутныя); лек. сродак ад глістоў, кашлю, залатухі, рахіту ў дзяцей і інш.

**АРЛЯ́НКА**, рака ў Беларусі, у Магілёўскім р-не, левы прыток р. Друць (бас. Дняпра). Даўж. 24 км. Пл. вадазбору каля 106 км$^2$. Пачынаецца каля в. Бярозаўка, вусце за 1,5 км на ПдЗ ад в. Малое Запаточча. Цячэ па Цэнтральнабярэзінскай раўніне. Рэчышча каналізаванае (17,4 км) ад в. Стары Сінін амаль да вусця.

**АРМАВІ́Р**, сталіца і рэліг. цэнтр стараж.-арм. Айрарацкага царства ў 4—2 ст. да н.э. Заснаваны на месцы г. *Аргішціхінілі*. Пасля перанясення ста-

ліцы ў г. *Арташат* прыйшоў у заняпад, але існаваў да 5 ст. н.э. Яго руіны каля с. Армавір у Арменіі.

**АРМАВІ́Р**, горад у Расіі, у Краснадарскім краі, на р. Кубань. Засн. ў 1839 пад назвай Армянскі аул. 178,7 тыс. ж. (1994). Вузел чыг. ліній і аўтадарог. Машынабудаванне і металаапрацоўка (эл.-тэхн., нафтавае машынабудаванне, прыладабудаванне і інш.), харч. (мясаканцервавая, малочная, алейна-тлушчавая), хім., дрэваапр., лёгкая прам-сць. Вытв-сць буд. матэрыялаў.

**АРМАГЕДО́Н** (грэч. Armagedōn), паводле Біблії месца збору сіл Сатаны для вырашальнай бітвы з Богам; у шырокім сэнсе — сімвал спрадвечнага процістаяння і апошняй бітвы Дабра са Злом. Такая ідэя выказана ў Старым запавеце, але тэрмін А. і канкрэтызаваны сюжэт належыць Адкрыццю св. Іаана Багаслова (Апакаліпсіс), паводле якога гэты паядынак павінен скончыцца перамогай Хрыста і Страшным судом, на якім канчаткова будзе вызначаны лёс усіх уваскрэслых: выратаваныя пойдуць у «нябесны Іерусалім», а недаваныя — у пекла. Ідэя А. ў рознай інтэрпрэтацыі падаецца некаторымі пратэстанцкімі канфесіямі (адвентыстамі, сведкамі Іеговы, Царквой уніфікацыі і інш.). Яна цесна звязана з хрысц. вучэннямі эсхаталогіі, прадвызначэння, хіліязму, а таксама з'яўляецца падставай для апалогіі ці абвяржэння канцэпцыі новай сусв. вайны, катастрофы і г.д.

*А.А.Цітавец.*

**АРМА́ДА** (ад ісп. armada флот, эскадра), устарэлая назва вялікай колькасці сабраных у адным раёне караблёў, самалётаў або танкаў, якія дзейнічаюць адначасова і ўзгоднена. Гл., напр., *«Непераможная армада»*.

**АРМАКАМЕ́ННЫЯ КАНСТРУ́КЦЫІ**, часткі будынкаў ці збудаванняў (сцены, калоны, слупы, прасценкі, перамычкі і інш.), мураваныя з каменю або цэглы і ўзмоцненыя *арматурай*. Для арміравання выкарыстоўваюць стальныя сеткі, якія ўкладваюцца ў гарыз. швы для павелічэння нясучай здольнасці А.к. пры сціскванні; стрыжні і дрот — укладваюцца ўнутры каменных элементаў і супрацьстаяць у асн. расцягванню. Выкарыстоўваюць таксама ўзмацненне каменнай муроўкі ж.-б. элементамі (комплексныя канструкцыі).

**АРМА́ТА**, 1) старажытная назва артыл. гарматы, якая з'явілася на Русі ў 2-й пал. 14 ст. 2) Назва на Беларусі, Украіне, у Літве і Польшчы ў 15—17 ст. разнастайнай зброі і засцерагальнага ўзбраення. 3) Назва артылерыі бел. гарадоў і замкаў у 15—17 ст.

**АРМАТУ́РА** (ад лац. armatura узбраенне, амуніцыя), дапаможныя, звычайна стандартныя прылады, прыстасаванні і дэталі, неабходныя для забеспячэння нармальнай работы абсталявання і трываласці канструкцый. А. **жалезабетонных канструкцый** успрымае пераважна расцягвальныя намаганні і стварае папярэдняе напружанне. Падзяляецца на рабочую (разліковую), мантажную і размеркавальную (канструкцыйную). А. павінна быць трывалая, пластычная, вязкая, добра зварвацца.

Найб. пашырана А. стальная стрыжнёвая (гарачакачаная, умацаваная тэрмічна і выцягваннем) і драцяная (арматурны дрот, пасмы, канаты, тканыя і зварныя сеткі). Дыям. стрыжнёвай А. 6—90 мм, драцяной 3—8 мм. Для паляпшэння счаплення А. з бетонам ёй надаюць перыядычны профіль. У якасці А. *жалезабетонных канструкцый* выкарыстоўваюць таксама шкловалакно і вырабы з яго, шклапластыкі і інш. А. **трубаправодная** рэгулюе цячэнне вадкасці, паліва, газу, пары па трубах. Падзяляецца на запорную, рэгулявальную, вадазборную і засцерагальную (вентылі, краны, засаўкі, клапаны, рэгулятары ціску, кандэнсатаадводчыкі і інш.). А. **электратэхнічная** — шчыткі, патроны, выключальнікі, штэпсельныя разеткі і вілкі, некаторыя дэталі эл. машын, дэталі і прыстасаванні для мацавання ізалятараў і правадоў і інш. А. **святлотэхнічная** — часткі асвятляльных прыстасаванняў, прызначаныя для размеркавання светлавога патоку і аховы вачэй ад яркіх прамянёў, для падводу эл. току, прымацавання і аховы лямпаў ад пашкоджанняў і інш. А. **пячная** (металургічных пячэй) — сукупнасць метал. частак, якія павялічваюць трываласць печы і ахалоджваюць яе вонкавую паверхню.

**АРМАТУ́РНЫЯ РАБО́ТЫ**, комплекс работ па вырабе, укладцы ў форму ці ўстаноўцы на месца бетанавання (мантаж) арматурных элементаў *жалезабетонных канструкцый*. Уключаюць нарыхтоўку арматурных стрыжняў, выраб арматурных сетак ці каркасаў, іх зборку і ўстаноўку ў форму ці апалубку.

Стрыжні робяць з арматурнай сталі на

Арляк звычайны.



**Арматура** жалезабетонных канструкцый: 1 і 2 — арматура перыядычнага профілю; 3 — дрот перыядычнага профілю; 4 — сямідротавая пасма; 5 — двухрадны канат.



Да арт. **Арматурныя работы.** Тэхналагічная схема вырабу шырокіх арматурных сетак на аўтаматызаванай паточнай лініі: 1 — стыкавая зварка стрыжняў; 2 — праўка стрыжняў; 3 — зварка сетак; 4 — падоўжная рэзка сетак; 5 — папярочная рэзка сетак; 6 — пакетаванне сетак; 7 — змотванне сетак у рулон; 8 — транспартаванне кантэйнера з пакетам сетак.

спец. станках, сеткі і каркасы — на станках з гібачнай бэлькай. Плоскія сеткі і каркасы шыр. да 1 м вырабляюць кантактнай зваркай на зварачных машынах і аўтаматызаваных паточных лініях, прасторавыя каркасы збіраюць у асн. на гарыз. і верт. кандуктарах-маніпулятарах. Арматуру для папярэдне напружаных канструкцый да ўкладкі ў форму расцягваюць гідраўл. домкратамі ці падаўжаюць нагреваннем да 300—450 °С. Арматуру для маналіт-




**Да арт. Арматурныя работы.** Арматурны станок-аўтамат: 1 — прыёмнае прыстасаванне; 2 — правільны барабан; 3 — механізм падачы і рэзкі; 4 — пульт кіравання.

канструкцый (напр., плацін) зварваюць з сетак, каркасаў і інш. элементаў, устаўляюць у формы або апалубку кранамі, маніпулятарамі і да т.п.

**АРМАЦЭМЕ́НТАВЫЯ КАНСТРУ́КЦЫІ**, танкасценныя будаўнічыя канструкцыі з дробназярністага бетону, арміраванага частымі тканымі ці зварнымі сеткамі з тонкага дроту. А.к. лёгкія, трывалыя, воданепранікальныя, адрозніваюцца дысперсным размеркаваннем трэшчын і замаруджаным іх раскрыццём. Выкарыстоўваюцца як апорныя і агараджальныя канструкцыі будынкаў і збудаванняў, пры буд-ве рэзервуараў, вадаводаў, невял. суднаў, водаахоўных элементаў метрапалітэна і г.д.

Адрозніваюць А.к. з дысперсным арміраваннем (да 4 тонкіх сетак з дроту дыям. 0,7—1 мм на 1 см таўшчыні канструкцыі) і камбінаваным (2 тонкія сеткі і 1 каркасная з дроту дыям. 3—4 мм). Іх робяць пераважна ў выглядзе тонкіх (10—30 мм) прасторавых канструкцый складкаватага і хвалепадобнага профіляў пралётам да 75 м. Канструкцыі пралётам да 18 м складаюцца з аднаго элемента, больш за 18 м — з некалькіх. А.к. вырабляюцца ў спец. матрыцах ці напырсканнем бетоннай сумесі.

**АРМЕ́ЙСКІЯ КАМІТЭ́ТЫ**, гл. *Салдацкія камітэты.*

**АРМЕ́НІЯ**, Рэспубліка Арменія. Размешчана ў паўд. частцы Закаўказзя. Мяжуе на Пн з Грузіяй, на У і ПдЗ з Азербайджанам, на Пд з Іранам, на З з Турцыяй. Пл. 29,3 тыс. км$^2$. Нас. 3677 тыс. чал. (1992). Дзярж. мова — армянская. Сталіца — г. *Ерэван*. Нац. свята — Дзень незалежнасці (28 мая).

**Дзяржаўны лад.** А. — дэмакр. рэспубліка. Дзейнічае канстытуцыя 1978. Кіраўнік дзяржавы — прэзідэнт. Вышэйшы заканадаўчы орган — Вярх. Савет, вышэйшы выканаўчы і распарадчы орган — Савет Міністраў, які ўзначальвае прэм'ер-міністр.

**Прырода.** А. займае паўн.-ўсх. ч. Армянскага нагор'я, акаймаванага паўн. і ўсх. хрыбтамі М.Каўказа. На Пн па мяжы з Грузіяй цягнецца Самхецкі хр. (2548 м, г. Лалвар), на Пд ад яго — Ларыйскае плато (выш. да 1400 м), уздоўж паўд. мяжы якога праходзіць Базумскі хр. Паміж Базумскім і паралельным яму Памбакскім хр. ляжыць Памбакская катлавіна, на ПнЗ — Джавахецкі хрыбет. На З узвышаецца вулканічны масіў Арагац (выш. да 4090 м). Хрыбты Гегамскі на З, Вардэнскі на Пд і Шахдагскі на ПнУ і У акружаюць тэктанічную ўпадзіну, у якой знаходзіцца высакагорнае воз. Севан. На ПдУ А. самы высокі ў Закаўказзі Зангезурскі хр. (выш. 3904 м, г. Капутджух), на ПнУ ад яго вулканічнае Карабахскае нагор'е (выш. 2000—3000 м). У паўд.-зах. частцы А. акумулятыўная Араратская раўніна (выш. 800—1000 м). Каля $^1/_3$ плошчы А. ўкрыта андэзітабазальтамі, туфамі, пемзамі, перлітамі і інш. прадуктамі вывяржэння вулканаў. Для асобных раёнаў А. характэрна сейсмічнасць. Працягваюцца гораўтваральныя працэсы, адбываюцца землетрасенні (апошняе катастрафічнае ў снеж. 1988). Карысныя выкапні: радовішчы медна-малібдэнавых, медна-калчаданавых, залатых, жал. і поліметалічных рудаў, нефелінавых сіенітаў, каменнай солі, буд. матэрыялаў (туфы розных адценняў і якасцяў, базальты, граніты, мармур, пемза, вапнякі, вогнетрывалыя гліны). Выяўлены прамысл. паклады паўкаштоўных і выразных камянёў (агат, біруза, яшма, абсідыян). Шмат мінер. крыніц. Клімат субтрапічны кантынентальны, сухі; асаблівасці абумоўлены горным рэльефам, блізкасцю Чорнага і Каспійскага мораў, уплывам засушлівага Іранскага і Малаазіяцкага нагор'яў. На раўнінах сярэдняя т-ра студз. -5 °С, ліп. 25 °С, ападкаў каля 400 мм за год. На горных плато і схілах гор (да 1400 м) сярэдняя т-ра студз. ад -4 °С да -6 °С, ліп. ад 18 °С да 20 °С, ападкаў каля 500 мм за год. У сярэднягор'і клімат умераны, сярэдняя т-ра студз. ад -2 °С да -8°С, ліп. 18 °С, ападкаў 600—800 мм за год. У высакагор'ях сярэдняя т-ра студз. ад -9 °С да -14 °С, ліп. ад 10 °С да 15 °С, магутнае снежнае покрыва. Рэкі А. бурныя, парожыстыя, багатыя гідраэнергарэсурсамі, буйнейшая пагранічная р. Аракс. Па тэр. А. цякуць прытокі рэк Аракс (Раздан, Арпа, Варатан і інш.) і Куры (Дэбед з Памбакам і Дзарагетам). Каля 100 горных азёраў, самае вялікае — Севан, для папаўнення якога прабіты горны 48-кіламетровы тунэль р. Арпа — Севан. Глебы Араратскай раўніны і прылеглых перадгор'яў (да 1200 м) шэраземныя і светла-бурыя, у паніжэннях саланчакі і сланцы. У паўд. раёнах да выш. 1800 і ў паўн. да 800 м — каштанавыя глебы, вышэй — горныя лугавыя, лясныя, лугава-тарфяныя; на вулканічных плато — горныя чарназёмы. У перадгор'ях калючыя хмызнякі, падушкападобныя астрагалы і акантамоны, ксерафільныя зараснікі. На паўн.-ўсх. (да выш. 2000 м) і паўд.-ўсх. (да выш. 2400 м) схілах лісцевыя лясы (усх. бук, дуб, граб). У стэпавым поясе (да 2100—2200 м) пераважае кавыльная і ціпчаковая расліннасць, вышэй — ксерафітнае рэдкалессе, субальпійскія і альпійскі лугі. На вяршынях (Арагац, Капутджух) фірнавыя палі і ледавікі.




**Армацэментавыя канструкцыі:** *а* — панэль хвалепадобнага профілю; *б* — зборна-маналіт-ная абалонка з армацэментавых элементаў (крыты рынак «Камароўскі» ў Мінску).

Жывёльны свет у перадгор'ях: паўзуны (гюрза, каўказская гадзюка), грызуны, скарпіёны, у трысняговых зараснікі — дзік, чаротавы кот, шакал; у гарах — безааравы казёл, сірыйскі мядзведзь, рысь, вавёрка і інш. Акліматызаваны янотападобны сабака, нутрыя, плямісты усурыйскі алень. Запаведнікі: Дыліжанскі, Карагельскі-Сіўліцкі (на мяжы з Азербайджанам), Хасроўскі, Эрэнійскі, Шыкахохскі. Нац. парк Севан.

**Насельніцтва.** Асноўнае насельніцтва — *армяне* (93,3%; 1992); жывуць таксама рускія, курды, украінцы, беларусы, грузіны, грэкі, асірыйцы і інш. У сувязі з арм.-азерб. канфліктам большасць азербайджанцаў выехала, а ў А. перасялілася значная колькасць армян з Азербайджана. Большасць вернікаў належыць да *Армянскай апостальскай царквы*. Сярэдняя шчыльнасць 115 чал. на 1 км$^2$. Натуральны прырост — 15 чал. на 1000 жыхароў. Гар. насельніцтва складае 68% (1989). 50% сельскага насельніцтва жыве ў горным поясе 1500—2000 м. Найб. гарады (1995): Ерэван (1248 тыс. ж.), Гюмры (211 тыс. ж.), Ва-

надзор (173 тыс. ж.), Эчміядзін (65 тыс. ж.), Раздан (64 тыс. ж.), Абавян (62 тыс.ж.).

**Гаспадарка.** Прамысловасць. Асноўныя галіны: машынабудаванне і металаапрацоўка, каляровая металургія, хім., нафтахім., лёгкая, харчасмакавая прам-сць, вытв-сць буд. матэрыялаў. Энергетычная база — ГЭС Севана-Разданскага каскада, ГРЭС у Раздане, ТЭЦ у Ерэване, АЭС у Мецаморы і інш. У машынабудаванні развіты эл.-тэхн., электронная, радыётэхн. прам-сць, прылада- і станкабудаванне, вытв-сць быт. тэхнікі (Ерэван, Гюмры, Ванадзор і інш.). Каляровая металургія ўключае вытв-сць медзі, алюмінію, канцэнтратаў малібдэну, свінцу, цынку. Выпуск пракату. Прадпрыемствы хім. і нафтахім. прам-сці вырабляюць сінт. каўчук, аўтамаб. шыны, сінтэтычныя смолы, пластмасы, серную кіслату, хім. валокны і інш. (Ерэван, Ванадзор, Алаверды). З галін лёгкай прам-сці вылучаюцца тэкст. і гарбарна-абутковая. Важнейшыя галіны харчасмакавай прам-сці — плодакансервавая, эфіраалейная, віна-каньячная, тытунёвая, разліў мінер. водаў. У прам-сці буд. матэрыялаў гал. роля належыць вытв-сці сценавых блокаў з натуральнага каменю, у т.л. на базе распрацоўкі радовішчаў каляровых туфаў, перлітаў, вапнякоў, граніту і мармуру, вытв-сць цэменту, шыферу, зборных жалезабетонных канструкцый і вырабаў.

**Сельская гаспадарка.** Плошча с.-г. угоддзяў складае 1,3 млн. га, з іх worыва 0,5 млн. га, пашы 1,6 млн. га. Земляробства сканцэнтравана пераважна на Араратскай раўніне, Шыракскім плато і ў раёне воз. Севан. 305 тыс. га с.-г. угоддзяў арашаецца. Гал. галіны раслінаводства — вінаградарства і пладаводства. Вырошчваюць збожжавыя (пшаніца, ячмень), тэхн. тытунь, цукр. буракі і гародніна-бахчавыя культуры. Жывёлагадоўля малочна-мясная і мяса-воўнавага кірунку (буйн. раг. жывёла, коза- і авечкагадоўля). Птушкагадоўля. Асноўныя віды транспарту — чыгуначны (эксплуатацыйная даўж. 870 км) і аўтамабільны (даўж. 7,6 тыс. км, у т.л. 7,3 з цвёрдым пакрыццём). Ёсць газаправодны транспарт, развіты авіяцыйны. Увозіць А. энерганосьбіты (прыродны газ), машыны, прадукты харчавання. Экспартуе трансп. абсталяванне, каляровыя металы, быт. тэхніку, вырабы харчасмакавай прам-сці. Каля 80% знешнегандлёвага абароту прыпадае на Расію і Беларусь. Грашовая адзінка — драм.

**Гісторыя.** Тэр. А. належыць да найб. стараж. цэнтраў сусв. цывілізацыі. Археал. знаходкі сведчаць пра засяленне Армянскага нагор'я першабытным чалавекам у 1-й пал. чацвярцічнага перыяду (Сатані-Дар). У неаліце тут пачалося земляробства. Культура бронзавага веку (3—2-е тыс. да н.э.) прадстаўлена паселішчамі Шэнгавіт, Шрэшблур, Элар, Лчашэн, Тагавараніст. У канцы 2 — пач. 1-га тыс. да н.э. на Армянскім нагор'і ўзнікаюць племянныя саюзы, пачынаецца працэс утварэння дзяржавы. На аснове буйных саюзаў уруатры, наіры, дайані ў 9 ст. да н.э. склалася рабаўладальніцкая дзяржава *Урарту*. Найб. значныя помнікі гэтага перыяду на тэр. А.: Ван (Тушпа), Эрэбуні, Тайшэбаіні, *Армавір*. Аслабленая ўнутр. супярэчнасцямі і націскам скіфаў у 6 ст. да н.э. Урарту распалася, яе тэр. ўключана ў стараж.-персідскую *Ахеменідаў дзяржаву*. Арм. народнасць у асн. склалася ў 2-й пал. 1-га тыс. да н.э. ў выніку змяшання абарыгенных плямёнаў Армянскага нагор'я (хаі, армены), якія атрымалі ў спадчыну высокую культуру Урарту. Пасля разгрому дзяржавы Ахеменідаў Аляксандр Македонскі ўключыў арм. землі ў сваю імперыю. У канцы 4 ст. да н.э. ад яе аддзяліліся самастойныя арм. царствы ў *Арменіі Малой* і Айрарацкай даліне. У канцы 3 ст. да н.э. Паўн.-Зах. А. (Сафена) і Паўд. А. трапілі пад панаванне *Селеўкідаў*. Каля 220 да н.э. Айрарацкае царства і Паўд. А. аб'ядналіся ў незалежную дзяржаву — *Арменію Вялікую*. У 189 да н.э. правіцелі Вял. А. і Сафены абвясцілі незалежнасць. З гэтага часу тут усталявалася дынастыя Арташэсідаў [189 да н.э. — 1 ст. н.э.], найб. вядомым прадстаўніком якой быў *Тыгран II*. У гады яго праўлення завяршылася аб'яднанне асн. арм. зямель. А. стала вял. дзяржавай эліністычнага свету. У яе гарадах Армавір, *Арташат*, Тыгранакерт, Аршамашат, Ервандашат, Вагаршапат былі развіты рамёствы і гандаль. З 1 ст. да н.э. А. стала арэнай барацьбы паміж Рымам і Парфянскім царствам і прыйшла ў заняпад. У 387 Вял. А. падзелена паміж Іранам і Візантыйскай імперыяй; б.ч. яе апынулася ў васальнай залежнасці ад Сасанідскага Ірана, але захавала самакіраванне на чале з намеснікам (марзпанам). У 301 А. прыняла хрысціянства. Пачалі складвацца феад. адносіны. Арм. народ вёў упартую барацьбу супраць іранскага панавання за аднаўленне незалежнасці. Буйныя паўстанні адбыліся ў 450—451 (пад кіраўніцтвам Вардана Маміканяна, закончылася *Аварайрскай бітвай 451*), 481—484, 571—572 і інш. У 2-й пал. 7 ст. А. заваявана Арабскім халіфатам. Сац. рух у 9—11 ст. праходзіў пад рэліг. сцягам (гл. *Паўлікіяне, Пандракійцы*). У ходзе працяглай барацьбы арм. народа з арабамі (паўстанні 703, 748—750, 774—775, 850—855) у канцы 9 ст. ўтварылася арм. царства *Багратыдаў*, у

Герб і сцяг Арменіі.

АРМЕНІЯ
Маштаб 1:2 500 000
І Р А Н
ГРУЗІЯ
АЗЕРБАЙДЖАН
ТУРЦЫЯ
РАСІЯ
Ерэван
Гюмры
Ванадзор
Эчміядзін
Раздан
Севан
Абавян
Мецамор
Арташат
Веды
Ігдыр
Масіс
Арарат
Джэрмук
Ехегнадзор
Вайк
Сісіян
Горыс
Лачын
Капан
Каджаран
Нахічэвань
Шарур
Шахбуз
Мегры
Ювадзі
Ардубат
Мартуні
Вардзіс
Камо
Чарэнцаван
Арзні
Аштарак
Арагац
Талін
Цахкадзор
Апаран
Артык
Гюмры
Спітак
Ванадзор
Дылижан
Чамбарак
Шамхор
Дашкасан
Ханлар
Гянджа
Іджэван
Берд
Тауз
Казах
Акстафа
Айрум
Алаверды
Сцепанаван
Ташыр
Гарэлаўа
Пернавут
Актэмберан
Мусун
Дыдым
Дагубаязіт
Базерган
Маку
Мерген
Садарак
Ленінакан
Гюмры
Ашатаван
Ахурян
Севан
Ерэванскае вадасховішча
Арпа-Севанскі тунель
Нагорны Карабах
Кельбаджар
Істысу
Лачынскі калідор
Зангезурскі хр.
Памбакскі хр.
Пласкагор'е
Араратская даліна
Араксінская нізіна
Нахічэванскае нагор'е
Малы Кавказ
Вялікі Кавказ
Араксінскі (Шахдагскі) хр.
Гегамскі хр.
Мурадаг
Вардзіскі хр.
Памбакскі хр.
Араксінскі хр.
Зангезурскі хр.
Карабахскае нагор'е
Араксінская нізіна
Араратская даліна
Вялікі Кавказ
Малы Кавказ
Араксінскі хр.
Зангезурскі хр.
Карабахскае нагор'е
Нагорны Карабах

якое ўвайшлі *Анійскае царства* і залежныя ад яго Ванандскае, Васпураканскае, Сюнікскае і Ташыр-Дзарагецкае царствы. Пачаўся ўздым эканомікі і культуры; цэнтрамі рамяства і гандлю сталі гарады Ані, Карс, Дзвін, Хлат, Маназкерт і інш. У 11 ст. А. заваявана Візантыяй, потым сельджукамі, а ў 13 ст. татара-манголамі. У выніку ліквідацыі дзяржаўнасці гарады А. прыйшлі ў заняпад, многія разбураны, значная частка насельніцтва знішчана. Вял. спусташэнні прынеслі А. паходы *Тахтамыша* і *Цімура*. Узмацнілася эміграцыя армян у інш. краіны. На ПдУ М. Азіі ўтварылася арм. Кілікійскае царства (1080—1375). На пач. 15 ст. А. захоплена вандроўнымі туркм. плямёнамі. У 16—18 ст. яна стала арэнай барацьбы паміж Турцыяй і Іранам, гаспадарка краіны руйнавалася, яе жыхары знішчаліся і высяляліся. У 1639 краіна падзелена: Усх. А. адышла Ірану, Зах. — Турцыі. Сац. і нац.-рэліг. прыгнёт выклікаў паўстанні армян (найбуйнейшае ў 1722—28 у Карабаху і Сюніку). З цягам часу ў паліт. плынях стала выспяваць арыентацыя на Расію. У выніку рус.-іран. вайны 1826—28 паводле *Туркманчайскага дагавора 1828* Усх. А. далучана да Рас. імперыі. Больш за 40 тыс. армян перасяліліся з Ірана ў Закаўказзе. Пасля рус.-тур. вайны 1828—29 з падпарадкаваных Турцыі арм. зямель ва Усх. А. перасялілася 90 тыс. армян. Зах. армяне, што заставаліся пад уладай Турцыі, неаднаразова паўставалі (Зейтунскае паўстанне 1862, вызв. рух 1870—80-х г.). Тур. ўлады арганізоўвалі (1895, 1896, 1908) масавую разню арм. мірнага насельніцтва. У 1-ю сусв. вайну тур. ўрад правёў генацыд арм. насельніцтва — знішчыў каля 1,5 млн. армян і каля 2 млн. выселіў у пустыні Месапатаміі, дзе большасць іх загінула. У памяць аб гэтай трагедыі 24 крас. лічыцца днём нац. жалобы. Выселеныя з Турцыі армяне аселі пераважна ў краінах Б. Усходу, Еўропы і Амерыкі. У ходзе барацьбы супраць рус. царызму і султанскага дэспатызму ў А. ўзніклі розныя грамадска-паліт. плыні і партыі, найб. уплывовай была партыя «Дашнакцыцюн» (гл. *«Дашнакі»*). У час рэвалюцыі 1905—07 у Расіі ў А. пракацілася хваля забастовак. Пасля Люг. рэвалюцыі 1917 Часовы ўрад стварыў у Закаўказзі Асобы Закаўказскі камітэт. У вострай паліт. барацьбе з бальшавікамі ў ліст. 1917 да ўлады прыйшлі дашнакі. 28.5.1918 урад дашнакаў аб'явіў незалежнасць А. У вер. 1918 Турцыя акупіравала значную ч. тэр. А. Паводле Батумскага дагавора 1918 паміж Турцыяй і Грузіяй тэр., падуладная ўраду дашнакаў, абмяжоўвалася толькі Эрыванскім і Эчміядзінскім паветамі. Пасля паражэння герм. блоку ў 1-й сусв. вайне (ліст. 1918) у Закаўказзе ўступілі англа-амер. войскі. У вер. 1920 паміж Турцыяй і А. пачалася вайна, якая прынесла новыя пакуты арм. народу (у акупіраваных туркамі раёнах загінула каля 198 тыс. чал.). У ліст. 1920 у А. адбылося ўзбр. паўстанне, падтрыманае Чырв. Арміяй. 29.11.1920 у Каравансараі ўтвораны Рэўком сав. А., які абвясціў А. сав. сацыяліст. рэспублікай. 2.12.1920 урад дашнакаў капітуляваў. 30.12.1922 А. разам з Азербайджанам і Грузіяй у складзе *Закаўказскай Федэрацыі* (ЗСФСР) увайшла ў СССР, з 5.12.1936 — як саюзная рэспубліка (Армянская ССР). У 1922 прынята першая Канстытуцыя Арм. ССР. Цяжар нявырашаных нац. праблем прывёў да абвастрэння адносін з суседзямі — у 1988 з-за тэр. прыналежнасці *Нагорнага Карабаха* паміж А. і Азербайджанам узнік канфлікт, які пазней набыў узбр. характар. Сац.-эканам. становішча абвастрылася пасля землетрасення ў снеж. 1988. На дапамогу арм. народу прыйшлі многія краіны, у т.л. Беларусь. На рэферэндуме ў вер. 1991 за незалежнасць А. выказалася 99% яе насельніцтва. 25.9.1991 Вярх. Савет А. прыняў «Дэкларацыю аб незалежнасці Арменіі». У кастр. 1991 прэзідэнтам краіны выбраны Л.Тэр-Петрасян. З 1991 А. — член СНД. У працівагу рашэнню Вярх. Савета Азербайджана аб скасаванні статуса Нагорна-Карабахскай аўт. вобласці А. прызнала акт абвяшчэння незалежнасці Нагорнага Карабаха. Паміж краінамі пачалася неаб'яўленая вайна. З 1992 вядуцца перагаворы па ўрэгуляванні азерб.-арм. канфлікту. Пасрэднікамі ў гэтым працэсе выступаюць Балтыйскі Савет, Арганізацыя па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (АБСЕ), дзейнічае Мінская група АБСЕ па Нагорным Карабаху.

А. — член буйных міжнар. арг-цый: ААН, АБСЕ і інш. Дыпламат. адносіны

Да арт. **Арменія.** Шыкахохскі запаведнік.

Да арт. **Арменія.** Горны пейзаж каля Ерэвана.




**АРМЕНІЯ ў 387–629гг.**

Маштаб 1:15 000 000

150 0 150 300км

- Дзяржава Вялікая Арменія на 387 г.
- Межы дзяржаў паводле дагавору 387 г. паміж Рымам і Сасанідскім Іранам
- Межы марзпанства Арменіі пасля 387 г.
- Межы іншых марзпанстваў
- Межы візантыйскіх правінцый (пасля 536г.)
- Цэнтры марзпанстваў і візантыйскіх правінцый
- 548 Раёны паўстанняў супраць панавання Сасанідаў і Візантыі (з указаннем года)
- × 451 Месцы і гады буйных бітваў паміж паўстанцамі і войскамі Сасанідаў
- Мяжа паміж Візантыйскай імперыяй і дзяржавай Сасанідаў паводле дагавору 591г. (пацверджана дагаворам 629г.)

з Рэспублікай Беларусь установлены ў 1993.

**Палітычныя партыі.** Арм. агульнанац. рух, Ліберальна-дэмакр. партыя, Рэсп. партыя, Хрысціянска-дэмакр. партыя, «Дашнакцуцюн», Партыя нац. адраджэння, Саюз канстытуцыйнага права, Нацыяналістычная партыя А., Камуніст. партыя А. і інш.

**Ахова здароўя.** У пач. 1992 на 10 тыс. ж. было 87 бальнічных ложкаў, 136 амбулаторна-паліклінічных устаноў, 40 урачоў. Узровень нараджальнасці 21 на 1 тыс. чал. Дзіцячая смяротнасць 18 дзяцей на 1 тыс. нованароджаных (1994).

**Асвета, навуковыя ўстановы.** У А. ажыццяўляецца ўсеагульнае абавязковае сярэдняе навучанне. Створана сістэма вышэйшай і сярэдняй спец. адукацыі. У 1991 у А. былі 1283 дашкольныя дзіцячыя ўстановы (143 тыс. дзяцей). У 1991/92 навуч. г. працавалі 1374 дзённыя агульнаадук. школы (592 тыс. вучняў, 54 тыс. настаўнікаў), 69 сярэдніх спец. навуч. устаноў (40,6 тыс. навучэнцаў), 14 ВНУ (66,1 тыс. студэнтаў, больш за 5,3 тыс. выкладчыкаў). Найбольшыя ВНУ: Ерэванскі ун-т (з 1920); ін-ты — політэхн., пед., мед., с.-г., нар. гаспадаркі, маст.-тэатральны, кансерваторыя і інш. На 1.1.1990 у А. 1,4 тыс. масавых б-к (21,8 млн. адзінак захавання), самыя вялікія б-кі: Дзяржаўная імя Мяснікяна, навук. б-ка АН Арменіі; 50 музеяў, у т.л. гісторыі Арменіі, прыродазнаўства, геалагічны, карцінная галерэя; 1,3 тыс. клубных устаноў. Навук. даследаванні вядуцца ў навук. установах, н.-д. ін-тах Акадэміі навук Арменіі (у яе складзе 43 акад., 59 чл.-кар., 1989), праблемных лабараторыях і канструктарскіх бюро пры мін-вах і ВНУ.

**Друк, радыё, тэлебачанне.** Найбуйнейшыя газеты: «Екір» («Краіна»), «Азг» («Нацыя»), «Голос Армении», «Республика Армения», «Эпоха». Нац. інфарм. агенцтва Армянпрэс (з 1920). Радыёвяшчанне з 1926 на арм., рус., азерб. і курдскай мовах. Ерэванскі радыёцэнтр перадае спец. праграму для армян, што жывуць за межамі краіны. З 1956 працуе Ерэванскі тэлецэнтр.

**Літаратура.** Найстаражытныя помнікі арм. культуры захоўваюць звесткі пра жыццё і барацьбу арм. плямёнаў дагіст. перыяду. Паданні і легенды («Нараджэнне Ваагна», «Гайк і Бел», «Ара Цудоўны і Шамірам», «Тыгран і Аждаан» і інш.) расказваюць пра барацьбу армян за незалежнасць і дзяржаўнасць, паказваюць зараджэнне этнічнай самасвядомасці, пошукі ў філас. асэнсаванні жыцця прыроды і Сусвету. Помнікам сусв. культуры з'яўляецца гераічны эпас 9 ст. *«Сасунцы Давід»*.

Арм. пісьменства пачыналася з клінапісных надпісаў (1-е тыс. да н.э.). У перыяд росквіту ў А. эліністычнай культуры існавалі летапісы, кнігі малітваў, паэт. і драматург. творы. Помнікі язычніцкай л-ры не захаваліся, яны знішчаны пасля прыняцця хрысціянства. Развіццю арыгінальнай і перакладной л-ры (жыційнай, царк., гіст., філас.) садзейнічалі вучоны-асветнік *Месроп Маштоц*, гісторыкі *Агатангелос*, Карун, Паўстас Бузанд, Егішэ, Маўсес Харэнацы і інш. У часы арабскага нашэсця і візант. экспансіі (7—9 ст.) пераважала царк. л-ра, асабліва духоўныя песні (шараканы), царк.-паліт. публіцыстыка, развівалася гістарыяграфія (Маўсес Каланкатаўцы, Себеос, Іаан Маміканян і інш.), паэзія (Камітас, Даўтак Кертох). Аднаўленне дзяржаўнасці А. (886) спрыяла адраджэнню л-ры. У паэзію пранікаюць свецкія матывы (*Грыгор Нарэкацы*). З пісьменнікаў 12 ст. вылучаюцца *Нерсес Шнаралі* і Мхітар Гош, з прадстаўнікоў гуманіст. паэзіі — Фрык, Канстанцін Ерзнкацы (13 ст.), *Наапет Кучак, Вардан Айгекцы* і інш. Пасля нашэсця мангола-татараў (14 ст.) і падзелу А. паміж Турцыяй і Персіяй настаў змрочны перыяд у культуры краіны. Некаторы яе ўздым адбыўся толькі на пач. 17 ст. Адраджэнне стараж. арм. цывілізацыі, традыцый мовы і л-ры былі гал. мэтай літ. руху «абнаўлення». Важную ролю ў ім адыгрывалі культ. цэнтры арм. калоній у Венецыі, Мадрыдзе, Калькуце, Канстанцінопалі і інш. Развіваюцца публіцыстыка (Аўсеп Эмін, Шаамір Шаміран, Маўсес Баграмян), паэзія (Нагаш Аўнатан, Петрас Капанцы, Багдасар Дпір, *Саят-Нава* і інш.). У 18 ст. ў арм. л-ры зараджаецца класіцызм (А.Ванандэці, П.Мінасян, А.Багратуні, Э.Гюрмюзян), у 1830—40-я г. адбываўся пераход да рамантызму. Уздым асветніцтва стварыў перадумовы для абнаўлення формы і зместу л-ры. Стараж. арм. мова (грабар) са-

Да арт. **Арменія.** Цясніна ракі Раздан.

Да арт. **Арменія.** Астрафізічная абсерваторыя каля Ерэвана.



ступае месца нар. літ. мове (ашхарабару). Прадстаўнікі новага літ. руху — А.Аламдаран, М.Тагіядзян, Х.*Абавян*, Г.Алішан і інш. У 2-й пал. 19 ст. развіваюцца грамадская думка і л-ра. У фарміраванні нац. ідэалогіі важная роля належала перыяд. выданням «Юсісапайл» («Паўночнае ззянне»), «Мегу» («Пчала»), «Мегу Айастані» («Пчала Арменіі»), «Мшак» («Працаўнік»), «Мурч» («Молат») і інш. Л-ра вызначаецца жанравай і стылёвай разнастайнасцю, шматграннасцю ахопу сац.-бытавых і нац. праблем. У паэзіі вядучае месца займае грамадз. лірыка (М.Пешыкташлян, Р.Патканян, М.*Налбандзян*, П.*Дуран*), развіваюцца гіст.-рамант. драма (Дуран, Пешыкташлян), сац.-бытавая камедыя (Г. *Сундукян*). Вядучы жанр л-ры 1870—90-х г. проза. На змену сінкрэтычнаму тыпу «нацыянальнага рамана» прыходзіць маналагічны раман: гістарычны (Цэрэнц, Г.*Мурацан, Рафі*), сацыяльны (П.Прашан, Г.Агаян, Ц.Камсаракан, А.Шырванзадэ), палітычны (Рафі), псіхалагічны (Мурацан, Нар-Дос) і інш. Дасягненнем маст. прозы сталі сатыра (А.*Параянян*), навелістыка (Р.Захраб). У 1880—90-я г. вядучым кірункам становіцца крытычны рэалізм, выступае «другое пакаленне» новай арм. паэзіі (І.*Іаанісян*, А.*Туманян*, А.*Ісаакян*). На пач. 20 ст. побач з рэалізмам існуе мадэрнісцкі кірунак з элементамі натуралізму, сімвалізму, неарамантызму. Эстэт. і філас. канцэпцыя адлюстравання рэчаіснасці выявілася ў гіст.-філас. драмах (Л.Шант), прозе (Э.Ацян, Ерухан, В.Папазян), паэзіі (Сіяманта, В.Тэр'ян, Д.Варужан). У 1920-я г. ўзнік шэраг літ. груповак і арг-цый. У 1927 створаны Саюз пралетарскіх пісьменнікаў, у 1934 — СП Арменіі. Сац. і ідэалаг. перамены ў жыцці, паказ новага і старога грамадства — галоўныя тэмы творчасці Е.Чарэнца, Д.Дэмірчана, С.Зарана, Н.Зарана, Г.Маары і інш. У л-ры 1950-х г. (А.*Шыраз*, А.*Сагіян*, Г.*Эмін*, С.*Капуцікян*, Р.Аванесян, Х.Даштэнц, С.*Хандзадзян* і інш.) падзеі 2-й сусв. вайны, змены ў грамадскім і сац. жыцці.

У 1960—70-я г. пашыраецца тэматычны і жанравы дыяпазон л-ры, скіраванай на абнаўленне выяўл. сродкаў, паглыбленне сац.-псіхал. аналізу з'яў і працэсаў, расце цікавасць да гіст. лёсу арм. народа і яго этнічнай самабытнасці (Г.*Матэвасян*, А.Айвазян, В.Петрасян, Р.Даваян, А.Грыгарац і інш.). У 1980-я г. ў л-ру прыйшлі В.Мугнецян, Л.Хечаян, В.Акапян і інш. Асобнае месца ў сучаснай арм. л-ры займае л-ра т.зв. спюрка, створаная армянамі, што жывуць у іншых краінах свету (А.Ашакян, Амстэг, Г.Шахнур, М.Ішхан, Захрат, А.Карапенц).

Да арт. **Арменія**. Манумент «Давід Сасунскі» ў Ерэване.

**Архітэктура**. Найб. старажытныя паселішчы на тэр. А. адносяцца да энеаліту. Высокай культурай адметныя збудаванні дзяржавы Урарту (9—6 ст. да н.э.). З перыяду элінізму (канец 1-га тыс. да н.э.) захаваліся рэшткі гарадоў Арташата, Тыгранакерта, крэпасць *Гарні*. У раннефеад. перыяд узніклі невял. замкі-крэпасці (Ані, 5 ст; Амберд, 7—13 ст.), палацы (у Дзвіне, 4—5 ст.; *Звартноцы*, 7 ст.), хрысціянскія храмы (Эчміядзінскі сабор, 4—19 ст.; Ерэруйская, Тэкорская базілікі, 5 ст.; цэрквы ў Мастары, Рыпсімэ, Аручы, 7 ст.). Збудаваннем 5—7 ст. характэрны кампактная кампазіцыя, гармонія прапорцый, лаканічнасць дэкору. У часы новага ўздыму дойлідства (пачынаючы з 9 ст.) пабудаваны крэпасці і замкі (Тыгніс, Бджні, Ахтамар (дойлід *Мануэл*), буйныя манастырскія комплексы (Татэў, Санаін, Ахпат, Гегард), гасцініцы, трапезныя, кнігасховішчы, караван-сараі, масты. Вялікі размах набыло горадабудаўніцтва ў г. Ані (кафедральны сабор, 989—1001, і храм Гагіка, дойлід *Трдат*), у 11—14 ст. — у Кілікійскім царстве (крэпасці, парты, палацы, манастыры, храмы, школы, шпіталі). З часу мангола-татарскага нашэсця буд-ва занепала і толькі пад сярэдзіну 17 ст. аднавілася (манастырскія комплексы Мунгі, Хор-Вірак і інш.). Нар. жыллё — глхатун (прамавугольнае ў плане са ступеньчатым драўляным шатром) — будавалася да 20 ст. Пасля далучэння да Рас. імперыі, асабліва ў канцы 19 — пач. 20 ст., у гарадах будавалі 2—3-павярховыя шматкватэрныя дамы часцей галерэйнага тыпу, будынкі грамадскага прызначэння. З 1930-х г. пачалася комплексная забудова жылых кварталаў, распрацоўваліся аб'ёмна-планіровачныя кампазіцыі паўд. тыпу жылля (арх. К.*Алабян*, Г.Кочар, М.Мазманян і інш.). У творчасці А.*Таманяна* спалучаліся сучасныя і традыц. арх. формы (Дом урада, 1926—41; тэатр оперы і балета, 1926—53; абодва ў Ерэване). Выкарыстанне ў буд-ве ружовага і белага туфу надае своеасаблівы каларыт гарадам і пасёлкам А. У 1960—80-я г. пошукі архітэктараў накіраваны на стварэнне новых арх. формаў і сродкаў маст. выразнасці на аснове сучасных канструкцый, буд. і аддзелачных матэрыялаў. У Ерэване пабудаваны драмтэатр імя Г.Сундукяна (1966, арх. Р.Алавердзян), стадыён «Раздан» (1967—72, арх. К.Акапян, Г.Мушэгян), Дом моладзі (1979, арх. С.Хачыкян, А.Тарханян, Г.Пагасян, М.Закаран), музей сучаснага мастацтва А. (1985, арх. Д.Тарасян, Г.Адамян), спарт.-канцэртны комплекс (1987, арх. Акапян, Мушэгян, Пагасян, Хачыкян; Дзярж. прэмія СССР 1987), аэрапорт «Звартноц» (каля Ерэвана, 1982, арх. Тарханян, Хачыкян, Л.Чаркезян, Ж.Шэхлян); мемарыял у памяць ахвяр генацыду армян 1915 (1965, арх. С.Калашан, Тарханян), манумент «Давід Сасунскі» (1959, скульптар Е.Качар), помнікі Е.Чарэнцу (1985, арх. Тарасян, скульптар М.Нікагасян), М.Сар'яну (1986, арх. Тарханян, скульптар Л.Такмаджан); Ерэванскі метрапалітэн (1981). Арх.-праектныя ін-ты распрацоўваюць планы забудовы нас. месцаў, што пацярпелі ад землетрасення ў снеж. 1988. Архітэктараў у А. рыхтуе буд. ф-т Ерэванскага політэхн. ін-та. У 1933 засн. Саюз архітэктараў А.

Да арт. **Арменія**. Кафедральны сабор у Ані. Арх. Трдат. 989—1001.

**Выяўленчае мастацтва**. На тэр. А. знойдзены наскальныя выявы 6-га тыс. да н.э., энеалітычная чарнаглянцавая кераміка з геам. узорам, маст. вырабы з металу і чырвонагліняная кераміка з чорнай размалёўкай (2-е тыс. да н.э.), вялізныя каменныя рыбы (вішапы). Рэшткі насценных размалёвак, ювелірныя вырабы адкрыты ва урарцкіх крэпасцях Эрэбуні і Тэйшэбаіні. Ад

эпохі эліпізму захаваліся сярэбраныя чашы і рытоны. Мазаікай і размалёўкай упрыгожаны сярэдневяковыя храмы ў Арусы, Таліне, Лмбаце (7 ст.), Татаеве на Ахтамары (10 ст.), Ахтале і Ані (12—13 ст.). Ранняя сярэдневяковая скульптура прадстаўлена стэламі 4—5 ст. з разнымі выявамі. З 9 ст. вядомы стэлы з выявамі крыжа ў арнаментальным абрамленні. З 10 ст. асн. відам выяўл. мастацтва стала кніжная мініяцюра (Т.Рослін, С.Піцак). У сярэдзіне 17 ст. з'явіўся станковы партрэт (А.Мркуз, М.Заграбян, Б.Салтанаў, сем'і Богушаў, Манасе), адзначаны ўплывам прыёмаў зах.-еўрап. рэаліст. жывапісу. Асобнае месца займаюць 6 пакаленняў мастакоў Аўнатанянаў (канец 17—19 ст.), у творчасці якіх фарміраваўся свецкі рэаліст. кірунак. У 19 ст. арм. жывапіс узбагаціўся гіст. і быт. жанрамі (А.Аўнатанян, С.Нерсісян, Г.*Башынджагян*, В.*Сурэнянц*). За межамі А. працавалі скульптары А.Тэр-Мерукян, А.*Гюрджан*, графік Э.Шаін. У фарміраванні арм. маст. школы ў 1920-я г. вял. ролю адыграла творчасць М.*Сар'яна*, С.*Агаджаняна*, Е.*Татэвасяна*, Г.*Гюрджана*, Ф.*Тэрлемезяна* і інш. Тэматычныя карціны стваралі С.Аракелян, А.*Каджан*, А.Бажбеук-Мелікян, нацюрморты — Г.Грыгаран. Развівалася манум. і станковая скульптура (А.*Саркісян*, С.Сцепанян, А.Урарту), станковая і кніжная графіка (Каджаан, Т.Хачванкян), тэатр.-дэкарац. мастацтва (Г.Якулаў, М.Арутчан, Сар'ян і інш.). У 1940—50-я г. наглядалася развіццё сюжэтнай карціны, пейзажа, нацюрморта (М.*Абегян*, М.*Асламазян*, М.*Зардаран*, Л.Бажбеук-Мелікян, С.*Мурудзян*, Т.*Ханджан*, В.Айвазян), скульптуры (Е.Качар, Н.*Нікагасян*, С.Багдасаран, Г.*Чубаран* і інш.). Сучасныя жывапісцы і графікі імкнуцца да аналіт. вывучэння аб'екта, асэнсавання гісторыі і нар. паданняў (А.Акапян, Р.Адалян, М.Петрасян, А.Укапян, А.Хачыкян, Р.Хачатран, Г. і Р.Элебікяны і інш.). У галіне тэатр. жывапісу працуюць А.Мірзаян, С.Арутчан; у дэкар.-прыкладным мастацтве — керамісты П.Сіманян, Р.Швердзян, А.Бдзеян і інш. Мастакоў у А. рыхтуюць Мастацка-тэатр. ін-т і маст. вучылішча імя Ф.Тэрмелезяна ў Ерэване. У 1932 засн. Саюз мастакоў А.

**Музыка**. У 2-м тыс. да н.э. на тэр. А. ва ўзаемадзеянні з муз. культурамі Пярэдняй і М.Азіі фарміравалася своеасаблівая муз.-паэт. традыцыя, у аснове якой строгая манадыйнасць (з элементамі поліфаніі) і складаная сістэма метрарытму. Сярод жанраў сял. фальклору стараж. абрадавыя, працоўныя, гульнёвыя, лірычныя, эпічныя, каляндарныя і пахавальныя песні, песні вандроўнікаў (пандухтаў). Фарміраванне арм. эпасу (6—4 ст. да н.э.) звязана з творчасцю спевакоў-казачнікаў (віпасанаў) і прафес. паэтаў, спевакоў і акцёраў (гусанаў); гэтая традыцыя прадоўжана ў творчасці ашугаў (Саят-Нава, 18 ст.; Шырын, Джывані, 19—20 ст.). Сярод муз. інструментаў: струнна-смычковыя — кемані, кеманча; струнна-плектарныя — саз, тар, уд; струнна-шчыпковыя — кнар, тавіг, канон, пандырн; духавыя — срынг, дудук, зурна; ударныя — даол тмбук, нагара; струнна-ўдарныя — сантур (разнавіднасць цымбалаў) і інш. Прафес. муз. культура А. напачатку была звязана з царк. пеўчай традыцыяй; з 4 ст. н.э. пашыраны псалмы, духоўныя гімны і шараканы, пазней — стэгі, зартугі, з 10 ст. — гандзы, духоўныя і свецкія тагі — разгорнутыя вакальна-інстр. лірыка-эпічныя кампазіцыі (Грыгор Нарэкацы, 10 ст.; Нерш Шнаралі, 12 ст.; Хачатур Кечарэцы, 14 ст.). Значны ўклад у арм. музыку сярэднявечча зрабілі музыканты і тэарэтыкі Саак Партэў, Давід Кераказ (5—6 ст.), Камітас, Ананій Шыракацы, Барыг Чон (7 ст.), Сцепанос Сюнецы 2-і (8 ст.), Акоп Крымецы (15 ст.). Да 15 ст. асновай натацыі арм. прафес. музыкі былі своеасаблівыя неўмы (хазы), якія ў 19 ст. заменены новай натацыяй. У 19 ст. пачалося актыўнае развіццё муз. адукацыі, збіранне і апрацоўка нар. песень (Х.Кара-Мурза, Н.*Тыграняна*), стварэнне муз. нар. і прафес. калектываў, асваенне жанраў оперы, аперэты, камерна-інстр. музыкі, раманса (Т.*Чухаджан*, Г.Еранян, Г.Карганаў). Асновы арм. нац. муз. стылю залажыў *Камітас*. На пач. 20 ст. напісаны творы, якія сталі нац. муз. класікай — сімф. карціна «Тры пальмы» (1905), сюіты «Крымскія эскізы» (1903, 1912) А.*Спендыярава*, опера «Ануш» (1912) А.*Тыграняна*, камерна-інстр. творы А.Тэр-Гевандзяна, С.Бархударана, вак. творы Р.Малікяна і інш. У 1933 створаны Саюз кампазітараў А. Кампазітарскую школу ўзначаліў А.*Хачатуран*. Сімф. музыка прадстаўлена творамі Хачатурана, А.Сцепаняна, Г.Егіязарана, у оперным і балетным жанрах працавалі Спендыяраў (опера «Алмаст», 1928), Хачатуран (балеты «Гаянэ», 1942; «Спартак», 1956), Б.Баласанян, Егіязаран, Сцепанян, у жанры аперэты — А.Айвазян, А.Далуханян, В.Катаян і інш. У 1960—80-я г. вылучыліся С.Агаджанян, А.Аруцюнян, С.*Бабаджанян*, Э.*Аганесян*, Р.Саркісян і інш. Сярод выканаўцаў: дырыжоры М.Таўрызіян, К.*Арбелян*; спевакі Г.*Гаспаран*, Н.Аванісян, П.*Лісіцыян*, З.*Далуханава*; піяністы Ю.Айрапецян, С.Навасардзян; скрыпачы І.Налбандзян, Р.Агаранян, А.Габрыэлян, Э.Тэтэвасян; віяланчэлісты М.Абрамян, С.Асламазян, Г.Адамян, Г.Таталян і інш. У А. працуюць (1995): Т-р оперы і балета імя Спендыярава, Т-р муз. камедыі, Дзіцячы муз. т-р, Хар. капэла, Дзярж. сімф. аркестр, сімф. аркестр. Дзяржтэлерадыё, Ансамбль нар. інструментаў, Ерэванскі камерны аркестр, струнны квартэт імя Камітаса; эстрадны аркестр, хор Харавога т-ва Арменіі, Ансамбль нар. песні і танца, Ансамбль нар. танца, Камерны хор Дзяржтэлерадыё; кансерваторыя (1923), Цэнтр. муз. школа, 5 муз. вучылішчаў, больш за 100 муз. школ і інш.

Да арт. **Арменія**. Рэльеф на фасадзе царквы Крыжа на востраве Ахтамар. 915—921.

Да арт. **Арменія**. Званіца Эчміядзінскага кафедральнага сабора. 1653—58.

Да арт. **Арменія**. Палац моладзі ў Ерэване. 1979.

**Тэатр.** Зараджэнне тэатр. мастацтва ў А. звязана з нар. святамі, стараж. культамі, рытуальнымі абрадамі. Пачаткам прафес. т-ра лічыцца 53 да н.э., калі ў сталіцы А. Арташаце была паказана трагедыя Еўрыпіда «Вакханкі» (т-р створаны царом Артаваздам II). У стараж. т-рах А. ставілі трагедыі грэч. і арм. драматургаў (выконвалі акцёры дзайнарку-гусаны і вохбергу-гусаны), камедыі і бытавыя драмы (катака-гусаны і катакергані), была пашырана пантаміма (актрысы-пантамімісткі вардзакі). У сярэднія вякі спектаклі паказвалі ў амфітэатрах (на ўзор антычных). Існаваў і сатыр. вулічны т-р гусанаўмімосаў, цахрацу. На аснове літургічнай драмы створаны хрысц. містэрыяльны т-р. З 1668 да сярэдзіны 19 ст. існаваў школьны т-р (царкоўны і свецкі). У 17—18 ст. у арм. калоніях узнік новы арм. т-р. У 1836 Г.Шэрмазанян стварыў у Тыфлісе «Шэрмазанян тэатр». У 1810 у Канстанцінопалі (культ. цэнтры зах. армян) адбыліся першыя арм. спектаклі. У 1846—66 тут існаваў прафес. т-р «Армян татрон», у 1850-я г. дзейнічалі аматарскія арм. трупы. У 1856 М.Пешыкташлян заснаваў арм. нац. т-р. Пастаянныя прафес. т-ры існавалі ў Канстанцінопалі (1861), Тыфлісе (1863, пад кіраўніцтвам Г.Чмшкяна), Эрывані (1873). Сцвярджэнне рэалізму ў арм. т-ры звязана з драматургіяй Г.Сундукяна і А.Параняна, пазней — А.Шырванзадэ, дзейнасцю акцёра і рэжысёра Чмшкяна, трагіка П.Адамяна. На пач. 20 ст. арм. нар. т-ры існавалі ў Тыфлісе, Баку, Эрывані. У 1921 створаны 1-ы Дзярж. т-р Арменіі ў Ерэване (з 1937 імя Сундукяна). У 1920—30-я г. ўзніклі дзярж. арм. т-ры ў інш. гарадах. У іх рэпертуары творы арм. драматургіі, рус. і зах.-еўрап. класікі; асаблівае месца займалі п'есы У.Шэкспіра. Вядомыя дзеячы тэатр. мастацтва А.: акцёры А.Авецісян, Г.Джанібекян, В.Гулазян, Д.Малян, Р.Нерсесян, В.Папазян, В.Вагаршан, Т.Сар'ян; рэжысёры В.Аджэмян, А.Бурджалян. У арм. т-рах пастаўлены бел. п'есы: «Хто смяецца апошнім» К.Крапівы, «Канстанцін Заслонаў» А.Маўзона, «Галоўная стаўка» К.Губарэвіча, «Лявоніха на арбіце» А.Макаёнка.

**Кіно.** Першыя хранікальныя кіназдымкі ў А. зроблены ў 1907. У 1923 створана кінастудыя «Дзяржкіно» (з 1957 «Арменфільм» імя А.Бек-Назарава). Першы дакумент. фільм — «Савецкая Арменія» (1924). Станаўленне маст. кіно звязана з дзейнасцю рэж. Бек-Назарава, які паставіў першы арм. маст. фільм «Намус» (1925). Найб. значныя фільмы нямога кіно: «Зарэ», «Злы дух», «Дом на вулкане», «Кікос», «Гікор». У 1930-я г. зняты фільмы «Пэпо», «Каро», «Зангезаур», «Храбры Назар», «Давід-Бек», першыя мультыплікацыйныя фільмы. Вытворчасць фільмаў павялічылася ў 1950-я г. У 1959 у Ерэване створана студыя хранікальных, дакумент. і навук.-папулярных фільмаў. У развіцці кінамастацтва А. значную ролю адыгралі рэжысёры Бек-Назараў, П.Бархударан, А.Марцірасян, А.Ай-Арцян, С.Кеворкаў, Э.Карамян, С.Параджанаў, акцёры Х.Абрамян, А.Джыгарханян, Г.Тонунц, М.Мкртчан і інш. У 1958 заснаваны Саюз кінематаграфістаў А.

*Літ.:* Абегян М. История древнеармянской литературы. Ереван, 1975; Налбандян В., Саринян С., Агабабян С. Армянская литература. М., 1976; Токарский Н.М. По страницам истории армянской архитектуры. Ереван, 1973; Мнацакян С.Х., Оганесян К.Л., Саинян А.А. Очерки по истории архитектуры Древней и Средневековой Армении. Ереван, 1978; Григорян А. Современная архитектура Армении. Ереван, 1983; Дурново Л.А. Очерки изобразительного искусства Средневековой Армении. М., 1979; Очерки по истории армянского изобразительного искусства. Ереван, 1979; Музыка советской Армении: Сб. ст. [М., 1960]; Музыкальная культура Армянской ССР: Сб. ст. М., 1985.

*В.К.Міхеева* (прырода, гаспадарка), *І.Ф.Раманоўскі* (гісторыя з 1918), *С.Сарынян* (літаратура), *А.М.Гарахавік* (музыка).



Армерыя звычайная.

**АРМЕ́НІЯ** (Armenia), горад у Калумбіі. Адм. ц. дэпартамента Кіндыо, на зах. схілах Цэнтр. Кардыльеры (на выш. больш за 1500 м). Засн. ў 1889. 187 тыс. ж. (1985). Канцавы пункт Ціхаакіянскай чыгункі. Цэнтр раёна па вырошчванні і перапрацоўцы кавы. Ун-т.

**АРМЕ́НІЯ ВЯЛІ́КАЯ**, старажытная дзяржава армян, якая займала большую частку Армянскага нагор'я. Пачала складвацца ў 6 ст. да н.э., пазней — сатрапія *Ахеменідаў*. У канцы 4—3 ст. да н.э. самастойнае царства. У 3—2 ст. да н.э. заваявана *Арташэсам I* і абвешчана незалежнай дзяржавай. Пры *Тыгране II* [95—56 да н.э.] самая вял. дзяржава эліністычнага Усходу. У вайне з Рымам страціла амаль усе заваяванні, у 114 абвешчана рымскай правінцыяй. Пазней царская ўлада ў А.В. адноўлена. На пач. 4 ст. н.э. пры *Аршакідах* уведзена хрысціянства як афіц. рэлігія. Феад. раздробленасць, барацьба паміж Іранам і Рымам за панаванне на Усходзе аслабілі А.В. У 387 падзелена паміж іранскімі Сасанідамі і Візантыяй.

**АРМЕ́НІЯ МАЛА́Я**, гістарычная вобласць у вярхоўях рэк Еўфрат, Лікус, Галіс. З яе тэр. звязана фарміраванне арм. народа і стараж.-арм. мовы. Увахо дзіла ў дзяржаву *Ахеменідаў*. Пры Аляксандру Македонскім пад уладай македанян, з 322 да н.э. самаст. царства са сталіцай у г. Ані-Камах. З канца 2 ст. да н.э. належала Пантыйскай дзяржаве, пазней Рымскай імперыі.

**АРМЕНО́ПУЛ** (Armenopulos) Канстанцін (1310 — 80 ці 1383), візантыйскі юрыст, складальнік практычнага дапаможніка па рымскім праве «Настаўленне да законаў, або Шасцікніжжа» (5 кніг пра розныя пытанні цывільнага права і адна пра злачынствы і пакаранні). Некаторыя палажэнні «Шасцікніжжа» мелі сілу закону (у Грэцыі) або былі крыніцай мясцовага права (у Бесарабіі).

**АРМЕ́РЫЯ** (Armeria), род кветкавых раслін сям. свінчаткавых. Каля 50 відаў. Пашырана ў арктычнай і ўмеранай зонах Паўн. паўшар'я. На Беларусі пераважна ў зах. раёнах трапляецца А. звычайная, або прадаўгаватая (A. vulgaris). Расце на заліўных і сухадольных лугах, схілах і ўзгорках на пясчанай глебе.

Шматгадовая травяністая расліна з прамастойнай бязлістай кветкавай стрэлкай выш. 15—50 см. Лісце вузкалінейнае, у разетцы. Кветкі ружовыя або белыя ў шарападобнай галоўцы. Плод — сухі аднанасенны мяшочак. Мае антыбактэрыяльныя ўласцівасці, дыурэтычны сродак; шэраг відаў вырошчваюць як дэкар. (напр., А. прыморская, бліскучая, альпійская, дзірваністая, японская, сібірская і інш.).

**АРМІЛЯ́РНАЯ СФЕ́РА** (ад лац. armilla бранзалет, кольца), старадаўні астранамічны інструмент для вызначэння экватарыяльных або эклiптычных каардынатаў нябесных свяцiл. Вядомы з 3 ст. да н.э., выкарыстоўваўся да канца 16 ст. Складаецца з некалькіх метал. кольцаў з дзяленнямі, якія маюць дыёптры і

могуць паварочвацца вакол свайго цэнтр. пункта. З'яўляецца мадэллю нябеснай сферы з яе найважнейшымі пунктамі і кругамі: полюсамі і воссю свету, мерыдыянам, гарызонтам, нябесным экватарам і эклiптыкай.

**АРМІ́НІЙ**, Армін (Arminius; каля 16 да н.э. — каля 21 н.э.), правадыр германскага племя *херускаў*. У маладосці камандаваў герм. атрадам у рым. войску, атрымаў рым. грамадзянства і званне конніка. У 7 н.э. вярнуўся на радзіму і ўзначаліў паўстанне герм. плямёнаў супраць рымлян, у 9 н.э. разбіў рым. армію *Вара* ў Тэўтабургскім лесе (тэр. на ПнЗ Германіі паміж далінамі рэк Везер і Эмс). Імкнуўся стварыць саюз герм. плямёнаў, але забіты ў выніку змовы радавой знаці херускаў.

**АРМІ́РАВАНАЕ ШКЛО**, ліставое сілікатнае *шкло*, у якое пры фармаванні запрасавана зварная метал. сетка. Выкарыстоўваецца для шклення светлавых праёмаў і пакрыццяў будынкаў і збудаванняў, святлопрапускальных перагародак, агароджы лесвічных клетак, шахтаў ліфтаў і г.д. Вырабляецца неперарыўным пракатам. Ад удару ці ўздзеяння высокай т-ры не рассыпаецца на асколкі. Дапускае разрэзку і адломку без растрэсквання. Сетка робіцца з дроту дыяметрам 0,35—0,45 мм. Святлопрапусканне 65% і болей.

**АРМІ́РАВАННЕ** (ад лац. armare умацоўваць, забяспечваць), умацаванне матэрыялу ці канструкцыі інш. матэрыялам. Выкарыстоўваецца пры вырабе жалезабетонных і каменных канструкцый (гл. *Армакаменныя канструкцыі, Армацэментавыя канструкцыі, Жалезабетонныя канструкцыі*), вырабаў са шкла (гл. *Арміраванае шкло*), пластмасаў, керамікі, гіпсу і г.д. (гл. *Арміраваныя матэрыялы*). Пашыраны *кампазіцыйныя матэрыялы*, арміраваныя высокатрывалымі валокнамі.

**АРМІ́РАВАНЫЯ МАТЭРЫЯ́ЛЫ**, матэрыялы, узмоцненыя іншымі, больш трывалымі матэрыяламі. Найб. пашыраныя А.м.: *жалезабетон* (узмоцнены *арматурай*), матэрыялы на аснове металаў, керамікі, пластычных масаў, шкла (гл. *Арміраванае шкло*), арміраваныя ніткі, валакністыя *кампазіцыйныя матэрыялы*. З буд. матэрыялаў арміраваннем атрымліваюць арміраваныя буд. канструкцыі (гл. *Армакаменныя канструкцыі, Армацэментавыя канструкцыі, Жалезабетонныя канструкцыі*).

Металічныя А.м. бываюць: гарачатрывалыя (напр., нікель, хром, кобальт і іх сплавы, арміраваныя тугаплаўкімі валокнамі вальфраму, малібдэну, карбідаў, аксідаў і нітрыдаў); нізкатэмпературныя канструкцыйныя (алюміній, магній, тытан і іх сплавы, арміраваныя высокатрывалымі валокнамі сталі, бору, берылію, карбіду і двухаксіду крэмнію); са спец. фіз. ўласцівасцямі (электракантактныя матэрыялы на аснове серабра і медзі, арміраваныя валокнамі вальфраму). З метал. А.м. робяць пасудзіны ціску, абалонкі, элементы самалётаў і суднаў, дэталі машын і прылад. Керамічныя А.м. — матэрыялы на аснове аксідаў, нітрыдаў, барыдаў і інш. тугаплаўкіх злучэнняў, арміраваныя валокнамі вальфраму, малібдэну, сталі і ніобію, а таксама ніткападобнымі крышталямі аксідаў і карбідаў. Выкарыстоўваюцца як вогнетрывалыя і канструкцыйныя матэрыялы. Арміраваныя пластыкі (*шклапластыкі, тэксталіт*, вуглепласты, *азбапластыкі, гетынакс*, метала- і борапластыкі і інш.) маюць у сабе ў якасці ўмацавальнага напаўняльніка валакністыя матэрыялы — сечаныя валокны, жгуты, тканіны, паперу, драўляную шпону. Арміраваныя ніткі складаюцца з асяродкавых (каркасных) нітак (надаюць трываласць), абвітых інш. матэрыяламі (для вонкавага эфекту, гіраскапічнасці, паветрапранікальнасці і інш.).

**А́РМІЯ** (франц. armée ад лац. armare узбройваць), 1) ваенны орган дзяржавы, прызначаны праводзіць яе палітыку сродкамі ўзбр. насілля.

Узнікла разам з дзяржавай. Кожная сац.-эканам. фармацыя мела адпаведныя формы арганізацыі. Вядомы А.: масавая, наёмная, міліцыйная, пастаянная, рэгулярная. Пастаянныя ўзбр. атрады разам з *апалчэннем* складалі аснову будаўніцтва першых рабаўладальніцкіх дзяржаў. Тады з'явіліся амаль усе формы арганізацыі А., якая складалася з лёгкай, сярэдняй і цяжкай пяхоты, конніцы, калясніц баявых і інш. У феад. эпоху фарміраваліся і выкарыстоўваліся таксама вярбовачныя і наёмныя войскі, у ВКЛ у 14—18 ст. аснову А. складала апалчэнне — т.зв. паспалітае рушэнне, ядром якога была княжацкая дружына, вярбовачныя і наёмныя атрады і інш. Пазней узнікла *кадравая армія* сучаснага тыпу.



Армілярная сфера.

2) Сукупнасць *узброеных сіл* дзяржавы. 3) Аператыўнае аб'яднанне пэўнага віду ўзбр. сіл. Складаецца з некалькіх злучэнняў і часцей розных родаў войскаў, у т.л. спец. войскаў. Выконвае аператыўныя задачы ў ходзе баявых дзеянняў. Бываюць А. агульнавайсковыя, танкавыя і інш. Кожная А. мае свой нумар або найменне. Звычайна А. ў час вайны ўваходзіць у склад фронту (групы А., армейскай групы), але можа дзейнічаць і самастойна. 4) Від узбр. сіл (побач з ракетнымі войскамі, войскамі ППА, ВПС, ВМФ). Гл. *Сухапутныя войскі*. 5) Частка ўзбр. сіл дзяржавы, спец. падрыхтаваная для раптоўнага нападу на тэрыторыю якой-н. краіны ў пачатку або ў ходзе вайны (А. нападу) або першаснай абароны граніцы дзяржавы ад раптоўнага нападу агрэсара, каб забяспечыць ваенную мабілізацыю і разгортванне гал. сіл (А. прыкрыцця). 6) У пераносным сэнсе — вял. колькасць людзей, аб'яднаных якой-н. агульнай справай, прыкметай (напр., працоўная А. і інш.).

**«А́РМІЯ ВЫРАТАВА́ННЯ»** (англ. Salvation Army), міжнародная рэлігійна-філантрапічная арг-цыя. Засн. ў 1865 у Лондане англ. прапаведнікам-метадыстам У.Бутсам, да 1878 наз. Хрысціянская місія. Дзейнасць арг-цыі пабудавана паводле ваен. прынцыпу (кіраўнік мае званне генерала). У рабоце спалучае пропаведзь Евангелля і практычную сац. службу, накіраваную на аблягчэнне становішча тых, хто церпіць нястачу і мае патрэбу ў дапамозе (арганізацыя грамадскіх сталовак, начлежак, бальніц, школ і г.д.). Дзейнічае ў 96 краінах, налічвае больш за 14 тыс. карпусоў-прыходаў (1994). Штаб-кватэра ў Лондане.

**А́РМІЯ КРАЁВА** (АК; Armia Krajowa літар. армія краіны), падпольная ваен. арганізацыя, якая дзейнічала ў 1942—45 на акупіраванай фаш. Германіяй тэр. Польшчы і частцы тэр. б. СССР (Украіна, Беларусь, Літва). Падпарадкоўвалася польск. эмігранцкаму ўраду ў Лондане. Камандуючыя АК: генералы С.Равецкі, Т.Камароўскі, Л.Акуліцкі. Налічвала 250—300 тыс. чал. У паліт. адносінах будавалася на аснове «надпартыйнасці», тэорыі «двух ворагаў» — Германіі і СССР. Зыходзячы з гэтага абмяжоўвалася арганізатарскай работай, фарміраваннем шырокай сеткі падп. арг-цый, стварэннем штабоў і інш. органаў, якія пасля краху акупац. рэжыму павінны былі забяспечыць прыход да ўлады эмігранцкага ўрада, аднаўленне граніц даваен. Польшчы. Пасля разрыву адносін паміж СССР і польск. эмігранцкім урадам (крас. 1943) узмацніліся тэндэнцыі канфрантацыі АК з сав. партыз. атрадамі. На тэр. Беларусі існавалі Навагрудская, Палеская і Віленская акругі АК. З 1942 арганізоўваліся партыз. атрады. У 1944 дзейнічалі злучэнні «Наднёманскае», «Поўнач», «Усход», «Захад» («Шчучынскае»), «Стоўбцы». Ажыццяўляючы аперацыю «Бура» (распрацавана ў кастр. 1943; прадугледжвала захоп тэр. Зах. Украіны, Зах. Беларусі і Віленшчыны ў момант адступлення ням.-фаш. войскаў), спрабавала авалодаць Вільнюсам і перашкодзіць аднаўленню сав. улады ў Вільнюсе, Львове, інш. гарадах. Адначасова асобныя падраздзяленні АК узаема-

дзейнічалі з сав. партызанамі, часцямі Чырв. Арміі, Гвардыі Людовай, уступалі ў Войска Польскае. Эмігранцкі ўрад і кіраўніцтва АК узнялі 1 жн. Варшаўскае паўстанне 1944, якое было жорстка задушана гітлераўцамі. АК распушчана 9.1.1945 эмігранцкім урадам. *А.М.Літвін.*

**А́РМІЯ ЛЮДО́ВА** (АЛ; Armia Ludowa літар. народная армія), узброеныя парты. і падп. фарміраванні Польскай рабочай партыі (ППР) у 2-ю сусв. вайну. Створана дэкрэтам *Краёвай Рады Народовай* (КРН) ад 1.1.1944 замест *Гвардыі Людовай*. У гал. камандаванне АЛ уваходзілі галаўком ген. М.Жымерскі («Роля»), нач. штаба, чл. ЦК ППР Ф.Юзвяк, прадстаўнік КРН Я.Чахоўскі. Мела 6 тэр. акруг (аб'ядноўвалі 23 раёны). Армія складалася з 16 партыз. брыгад (у т.л. некалькі фарміраванняў з Беларусі і Украіны) і 20 асобных батальёнаў і атрадаў (летам 1944 налічвала каля 60 тыс. чал.). Гал. задачы — барацьба супраць ням. акупантаў і падрыхтоўка да захопу ўлады ў паслявaен. Польшчы. Праводзіла дыверсіі на прамысл. аб'ектах і чыгункі, тэрарыст. акты супраць ням. акупац. адміністрацыі і жандармерыі. Вясной і летам 1944 атрады АЛ разам з сав. дыверсійна-разведвальнымі групамі вялі жорсткія баі з намнога большымі сіламі гітлераўцаў у Парчэўскіх і Яноўскіх лясах, Сольскай пушчы. На польска-бел. паграніччы супрацоўнічала з сав. партызанамі, якія дзейнічалі на Беларусі. Вясной 1944 для каардынацыі дзеянняў АЛ з войскамі Чырв. Арміі сав. камандаванне стварыла пры Ваен. савеце 1-га Бел. фронту Польскі партыз. штаб (адзін з кіраўнікоў С.В.Прытыцкі). Атрады АЛ дапамагалі наступаючым сав. войскам, вызвалілі некалькі польск. гарадоў. Камандаванне Чырв. Арміі перадавала АЛ кантроль над вызваленымі польск. тэрыторыямі. 21.7.1944 дэкрэтам КРН АЛ аб'яднана з Польскай арміяй у СССР у адзінае Войска Польскае.

*Л.В.Лойка.*

Н.Армстранг.

**А́РМКА-ЖАЛЕ́ЗА** (ARMCO — скарочаная назва амер. фірмы American Rolling Mill Corporation), назва тэхнічна чыстага (каля 99,85%) жалеза. Мае высокую пластычнасць, магн. пранікальнасць, павышаную электраправоднасць і ўстойлівасць да карозіі. Выкарыстоўваецца ў электрамашынабудаванні і лабараторнай тэхніцы, а таксама як шыхта пры вытв-сці некаторых легіраваных сталяў і сплаваў.

**АРМРЭ́СТЛІНГ** (англ. arm-wrestling ад arm рука + wrestling барацьба), від спорту, спаборніцтва ў сіле рук двух спартсменаў. Рукаборац, абапёршыся локцем на стол і абхапіўшы кісць вертыкальна пастаўленай рукі праціўніка, імкнецца паваліць яе. Вольнай рукой ён трымаецца за спец. выступ стала. Як від спорту А. аформіўся ў пач. 1960-х г. у ЗША. Развіваецца больш як у 70 краінах свету. На Беларусі з 1990, першы чэмпіянат адбыўся ў 1991, праводзіцца міжнар. турнір па А. «Белавежскі зубр». Існуе федэрацыя А. Бел. спартсменка А.Кандратава — чэмпіёнка свету па А. (1995).

**А́РМСТРАНГ** (Armstrong) Генры Эдуард (6.5.1848, Лондан — 13.7.1937), англійскі хімік-арганік. Скончыў Лейпцыгскі ун-т (1870). З 1871 праф. Лонданскага ун-та, у 1884—1913 — Цэнтральнага тэхн. каледжа. У 1893—95 прэзідэнт Лонданскага хім. т-ва. Распрацаваў (1888) хіноідную тэорыю колернасці, прапанаваў першую рацыянальную наменклатуру арган. злучэнняў (прынята ў Жэневе; 1892), даследаваў ферменты, тэрпены, камфару, займаўся крышталяграфіяй.

Л.Армстранг.

**А́РМСТРАНГ** (Armstrong) Луі Даніэл (4.7.1900, г. Новы Арлеан — 6.7.1971), амерыканскі трубач і спявак. Арганізатар і ўдзельнік першых негрыцянскіх джаз-бандаў у Новым Арлеане. У 1947 засн. секстэт «Усе зоркі Луі Армстранга», гастраліраваў з ім і як саліст-трубач у краінах Амерыкі, Еўропы, Афрыкі. Стварыў уласны стыль выканання, для якога характэрны імправізацыйная свабода, разнастайнасць тэмбравых фарбаў і рытмаформул. Аўтар блюзаў і джазавых песень.

*Літ.:* Коллиер Дж.Л. Луи Армстронг: Америк. гений: Пер. с англ. М., 1987.

**А́РМСТРАНГ** (Armstrong) Ніл (н. 5.8.1930, г. Уапаканета, штат Агайо, ЗША), касманаўт ЗША. Першы чалавек, які ступіў на паверхню Месяца. Скончыў ваенна-марское вучылішча лётчыкаў (1949), ун-т Перд'ю ў г. Лафеет (1955). З 1962 у групе касманаўтаў НАСА. Як камандзір карабля здзейсніў касм. палёты: 16.3.1966 з Д.*Скотам* на караблі «Джэміні-8», 16—24.7.1969 з М.Колінзам і Э.Олдрынам на Месяц на караблі «Апалон-11». На паверхні Месяца (21.7.1969) правёў 21 гадз 36 мін 21 с, у космасе 8,6 сут. Імем А. названы кратэр на Месяцы.

**АРМУ́ЗСКІ ПРАЛІ́Ў**, Хармузскі праліў, паміж Аравійскім п-вам і мацерыковай часткай Азіі. Злучае Персідскі і Аманскі залівы. Даўж. 150 км, найменшая шыр. 55,6 км. Глыб. ад 71 м да 219 м, на фарватэры 27,5 м. Шмат невял. скал і астравоў (Кешм, Армуз, Ларак і інш.). Транспартная магістраль па перавозе нафты. Порт — Бэндэр-Абас (Іран).

**АРМЯ́НА-ГРЫГАРЫЯ́НСКАЯ ЦАРКВА́**, гл. *Армянская апостальская царква.*

**АРМЯ́НЕ** (саманазва хай), нацыя, асн. насельніцтва *Арменіі* (2,7 млн. чал.). Усяго ў краінах СНД 4,1 млн. чал. (1979). Жывуць таксама ў ЗША, Францыі, Іране і інш. Агульная колькасць 54 млн. чал. (1987). Гавораць на *армянскай мове*. Сярод вернікаў пераважаюць хрысціяне-манафісіты.

**АРМЯ́НСКАЕ НАГО́Р'Е**, у Турцыі (пераважна), Іране, Арменіі, займае паўд. частку Грузіі і зах. частку Азербайджана. Пл. 400 тыс. км². Сярэдняя выш. 1700 м, найб. 5165 м (г. Вял. Арарат). Паверхня — спалучэнне лававatуфавых пласкагор'яў і плато выш. 1500—3000 м з міжгорнымі ўпадзінамі і далінамі. Шэраг хрыбтоў (Арсіянскі, Агрыдаг, Джавахецкі, Вардэнінскі) утвораны ланцугамі вулканаў. Найб. ўпадзіны: Араратская, Эрзурумская, Мушская і інш.; дно некаторых упадзін занята азёрамі Ван, Севан, Урмія (Рэзайе). Вулканічныя конусы (Сюпхан — 4434 м, Арагац — 4090 м і інш.) і лававае покрыва ўтварыліся ў неагене і антрапагене. Невулканічныя хрыбты: Зангезурскі, Паландзёкен, Бінгёль, Аладаг, Карадаг, Машудаг, Карабахскі і інш. Карысныя выкапні: нафта, мыш'як, медзь, храміты, жал. руда, поліметалічныя руды, каменны вугаль, каменная соль; мінеральныя і тэрмальныя крыніцы. Клімат субтрапічны кантынентальны. Сярэднія т-ры студз. ад -3 да -15 °С, ліп. ад 15 да 20 °С (у катлавінах 25 °С). Гадавая колькасць ападкаў на зах. схілах 1000 мм і больш, у катлавінах 500—700 мм, на У 300—500 мм. З А.н. пачынаюцца рэкі Еўфрат, Тыгр, Кура, Аракс. Расліннасць стэпавая і паўпустынная на шэразёмах, светла-каштанавых, бурых і шэра-карычневых

глебах. На схілах гор — хмызнякі з маквісу, лясы з хвоі і дубу, фісташкавыя і арчовыя рэдкалессі. На менш увільготненых схілах зараснікі калючых падушкападобных хмызнякоў. На выш. 4000 м горны стэп, вышэй — альпійскія лугі, на вяршынях вечныя снягі і ледавікі. Жывёльны свет: шмат грызуноў, паўзуны, трапляюцца казуля, безааравы казёл, муфлон, мядзведзь, барс, паласатая гіена. Аазіснае земляробства.

**АРМЯ́НСКАЕ ПІСЬМО́**, алфавітная сістэма, створаная каля 406 арм. епіскапам Месропам Маштоцам. Узнікненне А.п. было выклікана распаўсюджаннем хрысціянства (прынята армянамі ў 301) і неабходнасцю мець богаслужэбную л-ру на арм. мове. А.п. мае фанематычны характар. Першапачаткова алфавіт складаўся з 36 знакаў (кожны абазначаў асобную фанему), у 12 ст. дапоўнена 2 новымі літарамі. У такім складзе выкарыстоўваецца для перадачы сучаснай арм. мовы. Да пераходу на арабскія лічбы літары мелі і лічбавае значэнне. Кірунак пісьма злева направа, літарныя знакі запісваліся асобна. У якасці вытокаў А.п. разглядаецца грэч.-візантыйскае, сірыйскае і арамейскае пісьмо, аднак адназначнага рашэння гэтае спрэчнае пытанне не знайшло.

*А.А.Кожынава.*

**АРМЯ́НСКАЯ АПО́СТАЛЬСКАЯ ЦАРКВА́**, Армяна-грыгарыянская царква, адна са старадаўніх хрысц. цэркваў. Хрысціянства ў Арменіі пачало распаўсюджвацца ў першыя стагоддзі н.э., у 301 набыло статус дзярж. рэлігіі. Ад імя першага каталікоса Грыгора Пантэва А.а.ц. часам наз. грыгарыянскай. Да 6 ст. царк. іерархі Арменіі падпарадкоўваліся візантыйскай царкве, што абумовіла падабенства А.а.ц. з праваслаўем у дагматыцы і культавай абраднасці. Але А.а.ц. прытрымліваецца манафізіцтва (вучэння аб выключна божай, а не падвойнай, богачалавечай сутнасці Хрыста), якое яшчэ на халкідонскім сусв. саборы (451) было прызнана ератычным. У 506 на Дзвінскім царк. саборы А.а.ц. канчаткова адмежавалася ад візантыйскай і стала аўтакефальнай. Царкву ўзначальвае «вярхоўны патрыярх-каталікос усіх армян», які пажыццёва выбіраецца саборам епіскапаў у Эчміядзіне (гіст. цэнтр А.а.ц. каля Ерэвана). А.а.ц. мае замежныя іерархічныя прастолы: патрыяршыя ў Іерусаліме і Стамбуле і каталікоскі ў Кілікіі, якія прызнаюць сваю залежнасць ад Эчміядзіна; епархіяльныя ўпраўленні ў ЗША, Паўд. Амерыцы, Зах. Еўропе, Б. і Сярэднім Усходзе, на Д.Усходзе. *А.А.Цітавец.*

**АРМЯ́НСКАЯ МО́ВА**, самастойнае адгалінаванне *індаеўрапейскіх моў*. Мова *армян*; дзярж. мова *Арменіі*. Пашырана таксама сярод армян Азербайджана, Грузіі, Сірыі, Ірана, Лівана, Турцыі, ЗША, некат. краін Зах. Еўропы, Амерыкі. У лексіцы і фанетыцы ёсць агульныя рысы з мовамі Каўказа. У ёй больш за 50 дыялектаў. Фанетыка багатая зычнымі — 30 фанем; 6 галосных. Самая развітая і багатая граматычная катэгорыя — дзеяслоў.

Гісторыя літ. мовы падзяляецца на 3 перыяды: стараж.-арм. мова вядома з часу стварэння *армянскага пісьма* (5 ст.), вусны яе варыянт выйшаў з ужытку ў 11 ст., пісьмоваліт. (грабар) існавала да канца 19 ст.; сярэдні перыяд — 12—16 ст.; з 17 ст. фарміруецца новая літ. А.м. Сучасная літ. мова мае 2 варыянты: усх. (дзярж. мова) і зах. мова (сродак зносін армян за мяжой).

**АРМЯ́НСКІ ТАЎР**, Усходні Таўр, усходняя частка гор Таўр, у Турцыі. Працягласць каля 600 км. Выш. да 3090 м (г. Нурухак). Уключае хрыбты Ахыр, Энгізек, Малацця, Эргані, Нурхак, Хачрэш. Складзены з метамарфічных вывергнутых і асадкавых парод (вапнякі, пясчанікі). Развіты карст. Горы прарэзаны цяснінамі р. Джэйхан, Еўфрат, Тыгр. На паўн. сухіх схілах і ў ніжнім поясе — паўпустыні, вышэй — горны стэп. На паўд., больш вільготных схілах — зараснікі тыпу маквісу, вышэй — дубовыя паркавыя лясы, рэдкалессе з фісташніку і ядлоўцу, горны стэп і альпійскія лугі. Па Бітліскім і Пазарджыкскім праходах пракладзены чыгункі і шаша.

| Абрыс літар | | Тран скрып цыя | Лічбавае значэнне | Абрыс літар | | Тран скрып цыя | Лічбавае значэнне |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Ա | ա | a | 1 | Յ | յ | y | 300 |
| Բ | բ | b | 2 | Ն | ն | n | 400 |
| Գ | գ | g | 3 | Շ | շ | š | 500 |
| Դ | դ | d | 4 | Ո | ո | vo,o | 600 |
| Ե | ե | e | 5 | Չ | չ | č | 700 |
| Զ | զ | z | 6 | Պ | պ | p | 800 |
| Է | է | ə | 7 | Ջ | ջ | ǰ | 900 |
| Ը | ը | ъ | 8 | Ռ | ռ | rr | 1000 |
| Թ | թ | th | 9 | Ս | ս | s | 2000 |
| Ժ | ժ | ž | 10 | Վ | վ | v | 3000 |
| Ի | ի | i | 20 | Տ | տ | t | 4000 |
| Լ | լ | l | 30 | Ր | ր | r | 5000 |
| Խ | խ | x | 40 | Ց | ց | c | 6000 |
| Ծ | ծ | ts | 50 | Ու | ու | u | 7000 |
| Կ | կ | k | 60 | Փ | փ | ph | 8000 |
| Հ | հ | h | 70 | Ք | ք | kh | 9000 |
| Ձ | ձ | dz | 80 | Եւ | և | ev | |
| Ղ | ղ | gh | 90 | Օ | օ | o | |
| Ճ | ճ | tš | 100 | Ֆ | ֆ | f | |
| Մ | մ | m | 200 | | | | |

Армянскае пісьмо.

**А́РНА** (Arno), рака ў Італіі. Даўж. 248 км, пл. бас. 8,5 тыс. км². Пачынаецца ў Таскана-Эміліянскіх Апенінах, да г. Фларэнцыя цячэ па вузкай даліне, потым на ўзгоркавай раўніне, упадае ў Лігурыйскае м. Веснавыя і асенне-зімовыя паводкі. Моцныя навадненні. Сярэдні расход вады 138 м³/с. Суднаходная ў ніжнім цячэнні. На А. — гарады Фларэнцыя, Піза.

**А́РНАЛЬДСАН** (Arnoldson) Клас (27.10.1844, г. Гётэбарг — 20.2.1916), грамадскі дзеяч Швецыі, публіцыст. У 1881—87 дэпутат швед. парламента. Выступаў за нейтралітэт Швецыі і аб'яднанне сканд. краін. Адзін з заснавальнікаў Швед. саюза міру і арбітражу (1883). Удзельнічаў у вырашэнні нарв. канфлікту (1895—1905) як прыхільнік аддзялення Нарвегіі ад Швецыі. Нобелеўская прэмія міру (1908, разам з Ф.*Баерам*).

Ручнік з арнаментам. Мінская фабрыка мастацкіх вырабаў «Мастра». 1990-я г.

**АРНА́МЕНТ** (ад лац. ornamentum упрыгожанне), узор з рытмічна ўпарадкаваных элементаў для аздаблення твораў выяўл. і дэкар.-прыкладнога мастацтва, прадметаў побыту, арх. збудаванняў і інш. У залежнасці ад твора, яго формы, матэрыялаў, спосабу выканання можа быць маляваны, разьбяны, вышываны, тканы, плецены, інкруставаны, набіваны, гравіраваны і інш. Паводле характару бывае геаметрычны, раслінны (*пальмета, акант*), тэраталагічны

(стылізаваныя малюнкі звяроў, птушак), камбінацыі геам. і раслінных матываў (*арабескі*). У якасці матываў А. выкарыстоўваюць розныя знакі і эмблемы (гербы). Вядомы ўсім народам свету, вобразна адлюстроўвае іх нац. асаблівасці, характар пануючага маст. стылю. На Беларусі А. вядомы з часоў палеаліту, асабліва разнастайны ў эпоху неаліту. Тагачаснаму А. на вырабах з косці, дрэва, гліны надавалася сэнсавае і магічнае значэнне. Спецыфічныя рысы набыў у працэсе фарміравання бел. народнасці ў 13—16 ст., развіваўся ва ўзаемадзеянні з культурай інш. народаў. Адметнасцю вызначаюцца разьбяныя па ляўкасе арнаментальныя фоны бел. абразоў 16—18 ст. Шырокую вядомасць набыла *беларуская рэзь*, А. на *слуцкіх паясах*, кафлі, вырабах урэцканалібоцкага шкла і інш. Нац. рысы А. найб. ярка ўвасобіліся ў нар. дэкар.-прыкладным мастацтве. У *вышыўцы* і *ткацтве* пераважае геам. (пераважна рамбічны) чырвона-чорны А. на белым фоне палатна; у разьбяным дэкоры на прадметах побыту — зубчыкі, крыжыкі,

1

2

3

4

5

6

7

8

Да арт. **Арнамент**. 1. Вязанне. 1920. Магілёўская вобл. 2. Вышыўка. 18 ст. 3. Тканіна. 1920. Гродзенская вобл. 4. Тканіна. 1950. Гомельская вобл. 5. Тканіна. Канец 19 ст. Мінская вобл. 6. Посцілка. 1900. Піншчына. 7. Фрагмент ручніка. 1934. Талачынскі р-н, Віцебская вобл. 8. Вышыўка. 1920. Брэсцкая вобл.

шматпраменныя разеткі; у аздабленні нар. жылля — геам. салярны, стылізаваны раслінны і зааморфны. У цяперашні час А. страціў сваё сімвалічнае значэнне і выконвае чыста дэкар. ролю. Лепшыя ўзоры бел. А., узбагачаныя сучаснай рэчаіснасцю, выкарыстоўваюцца ў лёгкай і маст. прам-сці, архітэктуры, дэкар.-прыкладным мастацтве, маст. творчасці.

Да арт. Арнамент. Франтыспіс Карана Аргун-шаха. Егіпет. 1368—88.

*Літ.:* Соколова Т. Орнамент — почерк эпохи: [Альбом]. Л., (1972); Беларускі народны арнамент: [Альбом]. Мн., 1955; Peesch R. Ornamentik der Volkskunst in Europa. Leipzig, 1981 *Я.М.Сахута.*

**АРНАМЕ́НТЫКА**, спосабы ўпрыгожвання вакальнай і інструментальнай мелодыі; сукупнасць гукаў, якія аплятаюць асн. лінію мелодыі. Вытокамі звязана з мастацтвам *імправізацыі*, пашырана ў аўтэнтычным фальклоры. Адрозніваюць *мелізмы* і свабодную А. — апяванне гукаў асн. мелодыі рознымі *фігурацыямі, фіярытурамі, пасажамі*. Маст. функцыі і выразныя магчымасці А. ў значнай ступені залежаць ад асаблівасцяў муз. інструментаў, вышыні і рухомасці пеўчых галасоў і інш. Багаццем А. вызначаюцца дзямесцвенныя спевы ў старарус. пеўчым мастацтве, франц. клавесінная музыка 17—18 ст. («галантны стыль»), італьян. оперы 18 ст. Для сучаснай прафес. музыкі мала характэрная, за выключэннем твораў, заснаваных на стылізацыі. Вылучаюць суразмерную А. (перыяд. паўтор меладычных груп, пераважае ў інстр. музыцы) і несуразмерную ў характары rubato (акцэнтаванне асобных гукаў мелодыі, павышэнне экспрэсіі; пераважае ў вак. музыцы). *З.Я.Мажэйка.*

Да арт. Арнамент. Ворсавы дыван «Мараза». Ширванская група. Пач. 19 ст.

**АРНА́Т** (лац. ornatus), верхняе літургічнае адзенне рымска-каталіцкага духавенства. Складаецца з 2 палотнішчаў, закругленых унізе і змацаваных плечавымі швамі. Апранаецца паверх інш. адзення. Да эпохі барока А. мелі выгляд палярыны; яе перад аздабляўся вертыкальна нашытым пасам, тыльны бок — нашытым крыжам. Барочны А. меў фігурныя краі пярэдняга палотнішча, якое набыло абрыс віяланчэлі. На Беларусі захаваліся А. 17—19 ст., пашытыя з парчовых і шаўковых тканін, атласу, аксаміту адпаведнага канкрэтнай літургіі колеру (зялёнага, фіялетавага, белага, чырвонага, сіняга) і аздобленыя аплікацыяй або гафтам, тасьмой і карункамі з залатымі ці сярэбранымі ніткамі, часта жэмчугам і каштоўнымі камянямі. Выяўлены А., зробленыя са *слуцкіх паясоў* (у касцёлах вёсак Чарнаўчыцы Брэсцкага і Новая Мыш Баранавіцкага, г.п. Ружаны Пружанскага, г. Косава Івацэвіцкага р-наў). Калекцыі А. 17—18 ст. зберагаюцца ў Нац. музеі Беларусі і Нац. маст. музеі Беларусі; значная калекцыя А. 18—19 ст. — у Музеі стараж.-бел. культуры ІМЭФ АН Беларусі. *М.М.Яніцкая.*

Да арт. Арнамент. Маёлікавая абліцоўка сцен у палацы Таш-Хаўлі ў Хіве. 1830-я г.

**А́РНЕМ** (Arnhem), горад на У Нідэрландаў. Адм. ц. правінцыі Гелдэрланд. Засн. на месцы рым. паселішча. 128 тыс. ж.; з прыгарадамі 293 тыс. (1985). Порт на правым беразе Рэйна. Машынабудаванне, хім., фармацэўтычная, саляная, скураная прам-сць, выт-сць штучных тканін. Нідэрландскі музей пад адкрытым небам (нар. архітэктура, дэкар. мастацтва), сафары-парк. Паблізу А., у Атэрло — музей Кролер-Мюлер з калекцыяй карцін В. ван Гога. Арх. помнікі 14—18 ст.

**А́РНЕМ-ЛЕНД** (Arnhem Land), паўвостраў на Пн Аўстраліі. Абмываецца Тыморскім і Арафурскім морамі, зал. Карпентарыя. Даўж. каля 320 км. Шыр. да 460 км. Паверхня — паката-ўзгорыстае плато (выш. ад 180 м на Пн да 400 м на Пд), складзенае з пясчанікаў і расчлянёнае рэкамі на астанцовыя масівы. На Пн акаймаваны шырокай раўнінай, якая крута абрываецца да мора. Берагі моцна парэзаныя. Радовішча ураназадыевых (Рам-Джанглі), жал. рудаў, баксітаў. Клімат субэкватарыяльны. Сярэдняя т-ра паветра на працягу года каля 25°С, ападкаў ад 500 мм (зімой) да

Арнат. Баранавіцкі раён Брэсцкай вобл. 19 ст.

2000 мм (летам) за год. У далінах рэк вільготныя субэкватарыяльныя лясы (пальмы, фікусы), на наветраных схілах гор і на вяршынях масіваў эўкаліптавыя лясы і саванны. Жывёльны свет: мядзведзь каала, кенгуру, вамбаты, кусты; з птушак — казуары, папугаі, лірахвосты. На ПнЗ — порт Дарвін.

**А́РНІКА**, род кветкавых раслін, гл. *Купальнік.*

**АРНІТА**... [ад грэч. ornis (ornithos) птушка], першая састаўная частка складаных слоў, якая абазначае: «які адносіцца да птушак», напр., *арніталогія, арнітафауна.*

**АРНІТАЛАГІ́ЧНЫ ЗАКА́ЗНІК**, *біялагічны заказнік*, асн. мэтай утварэння якога з'яўляецца ахова, захаванне і аднаўленне асобных відаў птушак, іх

Арнем. Рынкавая плошча.

унікальных згуртаванняў і асяроддзя пражывання. На Беларусі 2 А.з. мясц. значэння: Дымаўшчына ў Віцебскім і Езярышчанскі ў Гарадоцкім р-нах Віцебскай вобл.

**АРНІТАЛО́ГІЯ** (ад *арніта... + ...логія), раздзел заалогіі*, які вывучае птушак, іх біялогію, геагр. пашырэнне, шляхі міграцый, экалогію і гасп. значэнне. Даныя А. ляжаць у аснове развіцця сістэматыкі, біягеаграфіі, папуляцыйнай біялогіі, выкарыстоўваюцца ў біёніцы, паразіталогіі, эпідэміялогіі.

Першы твор з апісаннем птушак вядомы з 4 ст. да н.э. («Гісторыя жывёл» Арыстоцеля). У 2-й пал. 16 — пач. 17 ст. з'явіліся працы натуралістаў франц. П.Белона, швейц. К.Геснера і італьян. У.Альдравандзі, якія абагульнілі звесткі па А. таго часу. У 1713 апублікавана класіфікацыя птушак, распрацаваная англ. біёлагам Дж. Рэем, у 1735 — навук. наменклатура птушак швед. вучонага К.Лінея. Даследаванні вучоных англ. Т.Гекслі, рус. М.А.Мензбіра і ням. М.Фюрбрынгера, Г.Гадова і Э.Зеленкі ў канцы 19 ст. паслужылі асновай сучаснай класіфікацыі птушак і вызначылі іх важнейшыя філагенетычныя сувязі.

На тэр. Беларусі першыя арніталагічныя звесткі належаць да сярэдзіны 18 — пач. 19 ст. (Г.Ржанчынскі, Э.Эйхвальд), у 2-й пал. 19 ст. звязаны з працамі К.Тызенгаўза, В.Тачаноўскага. Пэўным укладам у развіццё А. з'яўляюцца даследаванні ням. арнітолагаў А.Рэйханава, О.Цэдлітца, Х.Захтлебена і інш. у час 1-й сусв. вайны. Асновай сістэматычнага развіцця А. сталі даследаванні У.М.Шнітнікава і яго першая грунтоўная зводка «Птушкі Мінскай губерні» (1913). Далейшае развіццё А. звязана з дзейнасцю А.Штама, У.В.Стачынскага, С.В.Кірыкава, Я.Даманеўскага, І.М.Сяржаніна, А.У.Фядзюшына, М.С.Долбіка і інш. Н.-д. работа вядзецца ў Ін-це заалогіі АН Беларусі, у запаведніках, ВНУ. Праведзена біяцэналагічнае вывучэнне найб. важных у гасп. адносінах птушак (курыных, драпежных, галянастых, вадаплаўных); удакладнены склад фауны, стан і дынаміка насельніцтва птушак розных біятопаў у залежнасці ад уздзеяння на іх асн. антрапагенных фактараў, высветлена відавая разнастайнасць, эколага-фізіял. асаблівасці, феналогія размнажэння і інш. пытанні біялогіі найб. пашыраных відаў. Даследуюцца рэдкія віды птушак, абгрунтавана ўключэнне ў Чырв. кнігу Рэспублікі Беларусь відаў, якія патрабуюць асаблівай аховы, многія даныя А. выкарыстоўваюцца для распрацоўкі нац. сістэмы ахоўных тэрыторый.

*Літ.:* Федюшин А.В., Долбик М.С. Птицы Белоруссии. Мн., 1967; Никифоров М.Е., Яминский Б.В., Шкляров Л.П. Птицы Белоруссии: Справ.-определитель гнезд и яиц. Мн., 1989; Ильичев В.Д., Карташев Н.Н., Шилов И.А. Общая орнитология. М., 1982.

*М.Я.Нікіфараў.*

**АРНІТАФА́УНА** (ад *арніта... + фауна*), авіфауна, гістарычна сфарміраваная сукупнасць відаў птушак пэўнай мясцовасці, краіны або геал. перыяду. Сусветная А. аб'ядноўвае каля 8,6 тыс. відаў. На Беларусі 18 атр., каля 300 відаў і падвідаў. Найб. пашыраны вераб'інападобныя — 92 віды. Сучасныя рысы набыла ў пасляледавіковы перыяд. Эндэмікі адсутнічаюць. Мяшаная, паходзіць ад еўрапейскага (птушкі шыракалістых лясоў), сібірскага (птушкі цемнахвойных лясоў) і міжземнаморскага (птушкі хмызнякоў і адкрытых прастораў) тыпаў фаун. Найб. колькасць відаў (81) гняздуецца ў лясах, 52 віды — прыбярэжна-водныя. 224 віды гняздуюцца, 66 — мігранты або выпадкова залётныя, 9 трапляюцца толькі зімой. Паляўнічыя віды: цецярук, слонка, бакас, дупель, глушэц, рабчык, крыжанка, чыркі, шэрая курапатка і інш. У Чырв. кнізе Беларусі 75 відаў.

**АРНІТАХАРЫ́Я** (ад *арніта...* + *chōreō* ідў, пашыраюся), распаўсюджванне насення і пладоў раслін, спораў грыбоў з дапамогай птушак; прыватны выпадак зоахарыі. Птушкі разносяць насенне і плады ў лапках, дзюбах або зашчочных мяшках (напр., жалуды і арэхі разносяць сойкі, кедроўкі і інш.) — сінарнітахарыя. Назапашваючы корм, птушкі хаваюць яго каля пнёў, пад мох і ў інш. месцы. Часам насенне не трапіць усходжасці, калі праходзіць праз стрававальны тракт птушак (напр., аўсянкі, малінаўкі, дразды, амялушкі і інш. так пераносяць насенне рабіны, вішні, малін, каліны, чарніц, чаромхі і інш. раслін) — эндаарнітахарыя. А. адбываецца таксама пры выпадковым пераносе птушкамі пладоў, насення і спораў, якія прыліпаюць да пер'я, дзюбы і лапак — эпізоахарыя.

**АРНІТО́З** (ад *арніта... + ...оз*), псітакоз, вострая інфекцыйная хвароба дзікіх і свойскіх птушак, млекакормячых жывёл і чалавека. Узбуджальнік — хламідыя Chlamidia psittaci. У птушак суправаджаецца пашкоджаннем парэнхіматозных органаў, кішэчніка, паветраносных мяшкоў, ц.н.с. Крыніца інфекцыі — хворыя і перахварэлыя птушкі, асабліва ўспрымальны да яе маладняк. У мэтах прафілактыкі ўводзяць каранцін на птушкафермах, робяць дэзінфекцыю. Жывёлы і чалавек заражаюцца ад птушак і праз інфіцыраваныя яйцы. Характэрныя прыкметы: слабасць, санлівасць, панос, адсутнасць апетыту, дрыжыкі, выдзяленні з носа, цяжкае дыханне, кан'юнктывіт, паралічы, запаленне лёгкіх. Лячэнне тэрапеўтычнае.

**АРНІЦІ́Н**, α—γ-дыамінаваляр'янавая кіслата, $C_5H_{12}O_2N_2$, арганічнае рэчыва з групы *амінакіслот.*

Белыя крышталі, добра растваральныя ў вадзе і спірце, дрэнна — у эфіры. Атрымліваецца пры гніенні бялкоў і гідролізе *аргініну*. У свабодным стане ёсць у тканках млекакормячых і ў раслінах, уваходзіць у некаторыя антыбіётыкі (граміцыдзін С і інш.). А. — каталізатар пры сінтэзе мачавіны ў арганізме праз *арніцінавы цыкл*, прымае ўдзел ва ўтварэнні поліамінаў, здольны ператварацца ў *пралін*.

**АРНІЦІ́НАВЫ ЦЫКЛ**, цыкл мачавіны, цыкл Крэбса-Хензелейта, цыклічны ферментатыўны працэс утварэння *мачавіны* з вуглякислага газу, аміяку і аспарагінавай к-ты ў арганізме чалавека, некаторых пазваночных жывёл, раслін і мікраарганізмаў. Асн. рэакцыі А.ц. ў млекакормячых вывучаны англ. біяхімікамі Х. Крэбсам і К. Хензелейтам (1932 і інш.), адсюль другая назва. Спачатку да *арніціну* далучаецца карбамілфасфат (макраэргічны прадукт кандэнсацыі аміяку і вуглякислага газу) з утварэннем *цытруліну*, да якога затым далучаецца амінагрупа аспарагінавай к-ты, з утварэннем *аргініну*. Апошні гідралітычна распадаецца на мачавіну і арніцін, які зноў уключаецца ў цыкл ператварэнняў. На біясінтэз адной малекулы мачавіны ў цыкле расходуюцца 2 малекулы АТФ. Біял. значэнне А.ц. заключаецца ў вывядзенні з арганізма таксічнага для тканак аміяку.

**АРНО́ЛЬД** Фёдар Карлавіч (17.12.1819, С.-Пецярбург — 7.3.1902), рускі лесавод. Скончыў Лясны ін-т у Пецярбургу. Праф. Лясного (з 1857) і Земляробчага (з 1866) ін-таў у Пецярбургу. У 1876—83 дырэктар Пятроўскай земляробчай і лясной акадэміі. Навук. працы па гісторыі лесаводства, лясной таксацыі, аўтар падручніка лесаводства, спец. курсаў па лесаводстве.

*Тв.:* Русский лес. Т. 1—3. 2 изд. Спб., 1893—99.

**АРНО́ЛЬД БРЭШЫЯ́НСКІ**, Арнальда Брэшыянскі (лац. Arnoldus de Brixia, італьян. Arnaldo da Brescia; каля 1100, г. Брэша, Італія — 18.6.1155), італьянскі паліт. і царкоўны рэфарматар. Вучань П.*Абеляра*. У 1137 узначаліў барацьбу жыхароў Брэшы супраць епіскапа — сеньёра горада. Рашэннем Усяленскага сабора 1139 выдвараны з Італіі. За крытыку духавенства выгнаны з Францыі, Цюрыха. Вярнуўшыся ў Рым (1145), удзельнічаў у кіраванні Рымскай рэспублікай (1143—55), створанай у выніку антыпапскага паўстання, выступіў як ідэолаг барацьбы рымлян за захаванне рэспублікі, пазбаўленне духавенства ўласнасці і свецкай улады. Паводле распараджэння папы пакараны смерцю.

**АРНО́ЛЬФА ДЫ КА́МБІО** (Arnolfo di Cambio, каля 1245 — да 1310), італьянскі скульптар і архітэктар. Прадстаўнік Протарэнесансу. У скульптуры (грабніца кардынала дэ Брэй у царкве Сан-Даменіка ў Арвіета, каля 1282) звярнуўся да ант. спадчыны, дабіўся манумент. пластычнасці вобразаў; у архітэктуры (пачатыя ў канцы 13 ст. цэрквы Санта-Крочэ і Палаца Векэё ў Фларэнцыі) выступіў як прадстаўнік італьян. готыкі.

*Літ.:* Romanini A.M. Arnolfo di Cambio e lo «stil novo» del gotico italiano. 2 ed. Firenze, 1980. *Я.Ф.Шунейка.*

**«АР НУВО́»** (франц. art nouveau літар. новае мастацтва), пашыраная ў некаторых еўрап. краінах і ЗША назва стылю *мадэрн*.

**АРО́Л** (лац. Aquila), экватарыяльнае сузор'е. Найб. яркія зоркі 0,8 (Альтаір), 2,7 і 3,0 візуальнай зорнай велічыні. На тэр. Беларусі бачны вясной, летам і ўвосень.

**АРО́Л**, горад у Расіі, цэнтр Арлоўскай вобл., на р. Ака. Засн. ў 1566. 342,6 тыс. ж. (1994). Чыг. вузел. Машынабудаван-

Арніцінавы цыкл.

не (дарожныя машыны, пагрузчыкі, тэкст. машыны, станкабудаванне, прыладабудаванне; вытв-сць выліч. тэхнікі і інш.), металургія (вытв-сць сталі), лёгкая (трыкат., абутковая, швейная), харч. прам-сць. Вытв-сць буд. матэрыялаў (шкло, цэгла). *П.І.Рогач.*

**«АРО́Л»** («Adler»), кодавая назва карнай аперацыі, праведзенай ням. фашыстамі на акупіраванай Беларусі ў Вял. Айч. вайну 20.7.—10.8.1942 супраць партызанаў і цывільнага насельніцтва Клічаўскай партыз. зоны. Праводзілася сіламі баявой групы групенфюрэра СС Бах-Зелеўскі, часцей ахоўных дывізій, артдывізіёнаў, камандаў тайнай палявой паліцыі і СД, зондэркамандаў пад агульным камандаваннем ген.-м. Рыхерта. Ім процістаялі 11 партыз. атрадаў, больш за 2 тыс. партызанаў, падпарадкаваных 208-му партыз. атраду імя Сталіна (У.І.Нічыпаровіч), у зоне знаходзілася некалькі тысяч жанчын, старых, дзяцей. У выніку аперацыі было загублена больш за 1,5 тыс. чал., спалена 31 вёска, захоплены больш за 3 тыс. галоў жывёлы і інш. маёмасць.

**АРО́Л** М. (сапр. Пятэльскі Сцяпан Язэпавіч; каля 1890, мяст. Гарадок Беластоцкага пав. — канец 1917 ці пач. 1918), бел. паэт, перакладчык, публіцыст, фальклярыст. Скончыў царк. настаўніцкае вучылішча ў Ялоўцы (1909, Беласточчына). Настаўнічаў на Беласточчыне, Гродзеншчыне, Ковеншчыне. З 1914 на фронце. Узнаг. Ге-

М.Арол.

оргіеўскім крыжам. З 1909 друкаваўся ў «Нашай ніве». У паэзіі А. — матывы паняволення роднага краю і народа, роздум над рэнегацтвам часткі бел. інтэлігенцыі. Вершы адметныя лірызмам, паяднаннем рэальнага і абагульнена-сімвалічнага, філасафічнасцю. У іх прыкметны ўплыў вобразаў, матываў, паэтыкі Я.Купалы і Я.Коласа. Даследчык і прапагандыст бел. нар. песні. Лічыў яе крытэрыем высокага паэт. майстэрства. Перакладаў на бел. мову В.Бялінскага, дастасоўваючы думкі рус. крытыка да патрэб самасцвярджэння нацыі, гал. праблем маладой бел. л-ры. З укр. л-ры пераклаў байкі Л.Глібава.

*Тв.:* Лірнік. Мн., 1991.

*Літ.:* Лойка А.А. Гісторыя беларускай літаратуры. Дакастр. перыяд. 2 выд. Мн., 1989. Ч. 2. С. 459—561; Саламевіч Я.М. Арол — нашаніўскі паэт, перакладчык, публіцыст // Бел. мова і літаратура ў школе. 1988. № 6. *І.У.Саламевіч.*

**АРО́Л-КА́РЛІК** (Hieraaetus pennatus), птушка сямейства ястрабіных атр. сокалападобных. Пашыраны ў Паўд. Еўропе, Пярэдняй і Сярэдняй Азіі, Паўн.-Зах. Афрыцы. На Беларусі сустракаецца рэдка ў паўд. раёнах, занесены ў Чырв. кнігу.

Невялікі даўгахвосты арол, даўж. 46—60 см, масай 500—900 г. Размах крылаў каля 1,2 м. Апярэнне зверху бурае, знізу белаватае з вузкімі цёмнымі стракацінамі. Прылятае ў красавіку. Гнёзды на галінах дубоў і елак на выш. 8—22 м. Няце 1—3 яйцы. Корміцца дробнымі птушкамі і грызунамі. Здабычу высочвае ў палёце або падпільноўвае ў засадзе.

**АРО́Л-МАГІ́ЛЬНІК** (Aquila heliaca), птушка сямейства ястрабіных атр. сокалападобных. Пашыраны ў Паўд. Еўропе, Азіі, Паўн.-Зах. Афрыцы. На Беларусі вельмі рэдкі выпадкова залётны від. Жыве ў старых лісцевых і мяшаных лясах, якія чаргуюцца з адкрытымі мясцінамі. Занесены ў Чырв. кнігу СССР.

Вял. арол, даўж. цела 72—84 см, размах крылаў каля 2 м, маса 2,5—3 кг. Самкі большыя за самцоў. Дарослыя птушкі цёмна-бурай афарбоўкі, галава вохрыстая або белаватая, на плячах белыя плямы. Дзюба масіўная, моцная. Гнёзды з тоўстых галін на верхавінах высокіх дрэў. Нясе 2 (радзей 3) белыя яйцы. Корміцца пераважна дробнымі млекакормячымі, птушкамі, мярцвячынай. Карысны для сельскай і лясной гаспадаркі (знішчае шкодных грызуноў).

**АРО́Н** (Aron) Рэймон (14.3.1905, Парыж — 17.10.1983), французскі філосаф, сацыёлаг. Праф. Кёльнскага (з 1930), у 1956—68 праф. у Сарбоне, з 1970 — у Калеж дэ Франс, потым Берлінскага ун-таў. Паліт. аглядальнік газет «Le Figaro» («Фігаро», з 1947), «L'Express» («Экспрэс», з 1977). Адзін з аўтараў тэорый «адзінага індустрыяльнага грамадства» і «дэідэалагізацыі». Распрацоўваў т.зв. крытычную філасофію гісторыі. Лічыў, што прагрэс навукі і тэхнікі ў 20 ст. параджае пэўныя ідэалы і адначасова робіць немагчымым іх здзяйсненне, што вядзе да масавага песімізму. Драма цывілізацыі, паводле А., складаецца з супярэчнасці спосабаў існавання і ідэалаў дэмакр. і індустр. грамадства; дысгармонія гэтых 2 тэндэнцый сучаснай цывілізацыі робіць яе нестабільнай. Асн. працы: «Уводзіны ў філасофію гісторыі» (1938), «Этапы сацыялагічнай думкі» (1967), «Расчараванне ў прагрэсе» (1969), «Прамова ў абарону Еўропы, што дэградзіруе» (1977) і інш. Аўтар «Мемуараў» (1983).

**АРО́ННІК**, аройнік, арум (Arum), род кветкавых раслін сям. ароідных. Каля 15 відаў. Пашыраны ў Еўропе, Малой і Пярэдняй Азіі. 6 відаў трапляюцца ў лясах на Пд Еўрап. ч. б. СССР, на Каўказе і ў Сярэдняй Азіі. На Беларусі асобныя віды ў калекцыі Цэнтр. бат. сада АН.

Арол-карлік.

Арол-магільнік.

Ароннік альпійскі.

Шматгадовыя аднадомныя травяністыя расліны выш. 25—30 см з шара- або яйцападобным клубнем. Лісце суцэльнае, сэрца- або коп'епадобнае, бліскучае, на доўгіх чаранках. Аднаполыя кветкі ў катахах, укрытых пакрывалам белага, зеленаватага або цёмна-фіялетавага колеру. Плод — ярка-чырвоная ягада. Дэкар. і лекавыя расліны. Свежыя расліны атрутныя (ёсць рэчывы сапаніна-глюказіднага характару). Высушаныя клубні А. плямістага (A. maculatum) і інш. відаў маюць да 25% крухмалу, прыдатныя ў ежу.

**АРО́НЧЫК** Юдзіф Самойлаўна (19.12.1908, Мінск — 3.6.1993), бел. актрыса. Засл. арт. Беларусі (1938). Скончыла Бел. драм. студыю ў Маскве (1926, яўр. секцыя). Працавала ў Дзярж. яўр. т-ры БССР (да 1949). У 1950—56 у Т-ры драмы і камедыі пры Белдзяржэстрадзе. У 1970—90 маст. кіраўнік Мінскага нар. т-ра мімікі і жэсту Бел. рэсп. т-ва глухіх. Мастацтва А. вызначалася разнастайнасцю фарбаў у абмалёўцы характараў, глыбокім пранікненнем у псіхалогію персанажаў. З лепшых роляў: Вера Паўлаўна («Пяюць жаваранкі» К.Крапівы), Антаніна Цімафееўна («Выбачайце, калі ласка!» А.Макаёнка), Голда («Тэўе-малочнік» паводле Шолам-Алейхема), Лаўрэнсія («Фуэнтэ Авехуна» Лопэ дэ Вэгі), Мірандаліна («Карчмарка» К.Гальдоні).

**АРО́СКА** (Orozco) Хасе Клементэ (23.11.1883, г. Сапатлан, Мексіка — 7.9.1949), мексіканскі жывапісец. Адзін з заснавальнікаў нац. школы манум. жывапісу. У 1908—14 вучыўся ў АМ у Мехіка. Удзельнік мексіканскай рэвалюцыі 1910—17. У 1917—19 і 1927—34 жыў у ЗША. Аўтар серыі акварэляў «Мексіка ў рэвалюцыі» (1913—17), карцін, кніжных ілюстрацый, манум. размалёвак: фрэскі ў Нац. падрыхтоўчай школе ў Мехіка (1922—27), «Праметэй» у Памона-коледжы ў Клермонце ў Каліфорніі, ЗША (1930), капэлы ў Піядалаяры, шпіталі Каваньяса ў Гвадалахары (абодва 1938—39) і інш.

*Літ.:* Костеневич А. Х.К.Ороско. Л., 1969.

**АРО́ТАВАЯ КІСЛАТА́** (ад грэч. oros малодзіва), вітамін $B_{13}$, 2,4-дыоксіпірамідзін-6-карбонавая кіслата. Прысутнічае ў тканках жывёл, раслін і мікраарганізмах; стымулюе рост. Папярэднік пірымідзінавых асноў, неабходных для біясінтэзу *нуклеінавых кіслот*, сінтэзуецца з *аспарагінавай кіслаты* і карбамілфасфату. Вылучана ў 1905 з каровінага малака, выяўлена ў малацэ інш. жывёл і жаночым шмат у дражджах і печані. Каліевую соль А.к. выкарыстоўваюць у медыцыне.

**АРО́ЧКА** Мікола (Мікалай Мікалаевіч; н. 10.12.1930, в. Вецявічы Слонімскага р-на Гродзенскай вобл.), бел. паэт, літ.-знавец, крытык, празаік, перакладчык. Д-р філал. н. (1981). Скончыў БДУ (1956). З 1966 у Ін-це л-ры АН Беларусі. Друкуецца з 1949. Першы зб. паэзіі «Не ўсе лугі пакошаны...» (1958). У паэзіі А. спалучаюцца лірызм, задушэўнасць інтанацыі, роздум пра мінулае Бацькаўшчыны, трагізм вайны, што апаліла маленства паэта, складаныя праблемы сучаснасці (зб. «Ветраломная паласа», 1962; «Крылатае семя», 1967; «Кветкі бяссмертніка», 1972; «Матчына жыта», 1978; «Падземныя замкі», 1986). Адрадзіў ў сучаснай бел. л-ры жанр драм. паэмы («Курганне», 1980; «Крэва», 1982; «Шляхі і краты», 1984; «Судны дзень Скарыны», 1991). Аўтар аповесці «Хай расце маладая таполя» (1963), зб. вершаў для дзяцей «У

птушынай вёсцы» (1964). Даследуе сучасную бел. паэзію, жанр паэмы, літ. ўзаемасувязі (кн. «Валянцін Таўлай», 1969; «Сучасная беларуская паэзія», 1976; «Беларуская савецкая паэма», 1979; «Максім Танк», 1984; «Пад высокай зоркай: Паэзія М.Ю.Лермантава ў творчым лёсе Аркадзя Куляшова»,1990).

*Тв.:* Колас на ржышчы: Выбр. Мн., 1980; Памяць зярнятаў: Выбр. Мн., 1991.

*І.У.Саламевіч.*

**АРПА́**, Усходні Арпачай, рака ў Арменіі і Нахічэванскай Рэспубліцы, левы прыток Аракса. Даўж. 128 км, пл. бас. 2630 км$^2$. Пачынаецца на схілах Зангезурскага хрыбта, у сярэдняй ч. цячэ па міжгорнай катлавіне. Сярэдні расход вады 11,5 м$^3$/с (каля г.п. Ехенадзор, Арменія). Выкарыстоўваецца на арашэнне, таму летам воды А. не даходзяць да р. Аракс. Для перакіду водаў А. ў воз. Севан пабудаваны тунэль (48,6 км). У вярхоўях А. курорт Джэрмук.

**АРПА́ДЫ**, Арпадавічы, княжацка-каралеўская дынастыя ў Венгрыі [889—1301]. Правілі ў перыяд фарміравання феад. адносін і пачатку феад. раздробленасці. Заснавальнік дынастыі Арпад (Arpad) [889—907]. Найб. вядомыя прадстаўнікі: Іштван [997—1038, з 1000 першы кароль Венг. каралеўства Іштван I Святы], каралі Ласла I Святы [1077—95], Бела IV [1235—70].

**АРС НО́ВА** (лац. ars nova літар. новае мастацтва), прагрэсіўны кірунак у французскай і італьянскай музыцы 14 ст.; процілеглы тэрміну арс антыква (лац. ars antiqua старое мастацтва), які мае на ўвазе муз. мастацтва да пач. 14 ст. Тэрмін узнік каля 1320 у выніку дыскусіі паміж прадстаўнікамі новага мастацтва (Іаан дэ Мурыс, Філіп дэ Вітры) і старога (Якаб Льежскі) і адлюстраваў пералом, што адбыўся ў франц. музыцы таго часу. У сучасным музыказнаўстве тэрмін «А.н.» часта выкарыстоўваюць у значэнні шырокай гісторыка-стылявой катэгорыі, якая характарызуе зах.-еўрап. музыку 14 ст. як новы этап у развіцці муз. мастацтва на шляху ад сярэднявечча да Адраджэння. Гал. рысы: адмаўленне ад выкарыстання выключна жанраў царк. музыкі і зварот да свецкіх вак.-інстр. камерных жанраў (ронда, балада, вірэле ў Францыі, балаты, мадрыгалы, качы ў Італіі), збліжэнне з бытавой песеннасцю, выкарыстанне розных муз. інструментаў.

**АРСЕ́Н**, Арсен Адзелашвілі (? — 1843), удзельнік сялянскага руху ў Грузіі ў 1-й пал. 19 ст. Адабраныя ў багацеяў каштоўнасці і маёмасць ён раздаваў беднякам, за што набыў павагу прыгнечанага народа. Яму прысвечана груз. нар. паэма «Песня пра Арсена» (створана ў 1840-я г., апубл. ў 1872). Яго вобраз як нар. героя ўвасоблены ў творчасці многіх пісьменнікаў, адлюстраваны ў драматургіі і кіно.

**АРСЕНА́Л** (франц. arsenal), установа для захоўвання ваеннай зброі і боепрыпасаў. Узніклі ў 16 ст. Да канца 19 ст. займаліся таксама вырабам, рамонтам і зборкай узбраення і боепрыпасаў. У Расіі гал. А. былі ў Маскве, Пецярбургу, у Англіі — у Вуліджы, у Францыі — у Ліёне, у Германіі — у Мюнхене, у Італіі — у Турыне, у ЗША — у Спрынгфілдзе. У 20 ст., калі вытв-сць зброі была вылучана ў самастойную галіну прам-сці, А. сталі выконваць функцыі базаў і складоў рознага прызначэння. У Францыі і ЗША А. наз. некаторыя суднабуд. заводы.

На Беларусі А. (*цэйхгаузы*) будавалі ў вял. замках, абарончых вузлах гарадоў, сядзібна-палацавых комплексах. У мураваных або драўляных 1- або 2-павярховых будынках вылучаліся памяшканні, дзе захоўваліся гарматы, ручныя стрэльбы, халодная зброя, запасы пораху, ядраў, куль і інш. У 17—18 ст. А. існавалі ў Слуцку, Крычаве, Бабруйску і інш. гарадах, у 19 ст. — у Бабруйскай і Брэсцкай крэпасцях.

**АРСЕНАПІРЫ́Т** (ад лац. arsenicum + *пірыт*), мыш'яковы калчадан,



Х.Ароска. Мужчына з агню. Фрэска на купале капэлы ў г. Піядалаяра. 1938—39.

мінерал класа сульфідаў FeAsS. Прымесі кобальту, нікелю, золата і інш. Крышталізуецца ў манакліннай або трыкліннай сінганіі. Утварае прызматычныя крышталі, зросткі, зярністыя і інш. агрэгаты. Колер алавяна-белы. Бляск металічны. Цв. 5,6—6 г/см$^3$. Шчыльн. 5,9—6,3 г/см$^3$. Тыповы мінерал гідратэрмальных (у т.л. часта залатаносных), радзей пегматытавых і кантактава-метасаматычных радовішчаў. Руда мыш'яку, іншы раз кобальту і золата.

**АРСЕНА́ТЫ**, солі ортамыш'яковай кіслаты $H_3AsO_4$. А. шчолачных металаў і аміяку раствараюцца ў вадзе. Атрымліваюць растварэннем аксіду мыш'яку ($As_2O_5$) у шчолачах. А. цяжкіх металаў атрымліваюць узаемадзеяннем расвораў іх соляў з А. шчолачных металаў. Выкарыстоўваюць як інсектыцыды, антысептыкі для прамочвання драўніны, кампаненты люмінафораў, п'еза- і сегнетаэлектрыкі. Водараствáральныя А.— моцныя яды.

**АРСЕНІ́ДЫ**, хімічныя злучэнні металаў з мыш'яком. Вядомыя для ўсіх металаў (і паўметалаў), акрамя сурмы, вісмуту, свінцу і талію. Крышт. рэчывы з метал. бляскам, маюць высокія т-ры плаўлення ( напр., для А. серабра $t_{пл}$ 1740 °С). А. галію (GaAs) і індыю (InAs) — паўправадніковыя матэрыялы, якія вы-

М.Арочка.

А.Дз.Арсенка.

карыстоўваюцца ў лазерах, выпрамніках і інш. Гл. таксама *Мыш'яку злучэнні.*

**АРСЕ́НІЙ** (Старац; ? — 1681), разьбяр па дрэве; майстар *беларускай рэзі.* Манах Куцеінскага Богаяўленскага манастыра (пад Оршай). Пасля 1655 працаваў у майстэрні Іверскага манастыра на Валдаі; магчыма, удзельнічаў у стварэнні разных дзвярэй сабора гэтага манастыра. Пазней выконваў работы для Васкрасенскага сабора Новаіерусалімскага манастыра (г. Істра Маскоўскай вобл.). У 1667 узначальваў майстэрню разьбяроў у Аружэйнай палаце Крамля. Кіраваў работай па аздабленні драўлянай разьбой палаца ў Каломенскім (зараз у межах Масквы). Стварыў «іарданскую сень» на 4 калонах для Суздаля (1668, цяпер — у саборы Раства Багародзіцы ў Суздалі).

*Літ.:* Абецедарский Л.С. Белорусы в Москве XVII в.: Из истории рус.-бел. связей. Мн., 1957.

**АРСЕ́НІК**, тое, што *мыш'як.*

**АРСЕНІ́ТЫ**, солі мыш'яковістых кіслот $HAsO_2$ і $H_3AsO_3$. А. шчолачных металаў і амонію раствараюцца ў вадзе, астатнія — у к-тах. Выкарыстоўваюць як інсектыцыды напр. парыжскую зелень $Cu(CH_3COO)_2 \cdot 3Cu(AsO_2)_2$, кампаненты неабрастальных фарбаў для суднаў, пігменты для маст. фарбаў. Водараствaральныя А. — моцныя яды.

**АРСЕ́НКА** Арсен Дзіянісавіч (15.3.1903, г.п. Новая Вадалага Харкаўскай вобл. — 30.8.1945), бел. і ўкр. спявак (барытон). Нар. арт. Беларусі (1944). Скончыў Харкаўскі муз.-драм. тэхнікум (1928). З 1928 у оперных т-рах Украіны, з 1936 у Вял. т-ры СССР. З 1937 саліст Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі. Творчасць А. вылучалася высокай вак. культурай, арыгінальнасцю ў муз. і

сцэн. трактоўцы вобразаў. Першы выканаў гал. партыі ў операх «У пушчах Палесся» А.Багатырова (Кузьміч), «Кветка шчасця» А.Туранкова (Андрэй). Найб. значная работа — вобраз Фігара («Севільскі цырульнік» Дж. Расіні). Інш. партыі: Змітрок, Апанас («Міхась Падгорны» і «Алеся» Я.Цікоцкага), Эскамільё («Кармэн» Ж.Бізэ), Рыгалета, Жэрмон («Рыгалета», «Травіята» Дж. Вердзі), Ялецкі, Анегін («Пікавая дама» і «Яўген Анегін» П.Чайкоўскага). Выступаў як камерны спявак.

*Літ.:* Смольскі Б. Арсен Арсенка // Слова пра майстроў сцэны. Мн., 1967.

**АРСЕ́ННЕВА** Наталля Аляксееўна (н. 20.9.1903, г. Баку), бел. паэтэса. З роду Арсенневых, па генеалогіі звязаных з М.Лермантавым. Дзяцінства і юнацтва правяла ў Вільні. Скончыла Віленскую Першую бел. гімназію (1921). Вучылася ў Віленскім ун-це (1921—22). Жыла з сям'ёй у Слоніме, затым у Польшчы. У 1939—40 супрацоўніца газ. «Вілейская праўда» (з 1940 «Сялянская газета»). Як жонка інтэрніраванага польск. афіцэра Ф.Кушаля адбывала з дзецьмі ссылку ў Казахстане (1940—41). У час Айч. вайны працавала ў «Беларускай газэце», якая выдавалася ў акупіраваным нямецка-фашысцкімі захопнікамі Мінску пад кантролем герм. акупац. улад. З 1944 у Германіі. З 1949 жыве ў ЗША. Друкуецца з 1920. У творчасці А. пераважае пейзажная лірыка. Ёй уласцівы лірызм, эмац. выразнасць, сінтэз жывапісных і муз. слоўна-выяўл. сродкаў. Праблематыка творчасці паглыбляецца асэнсаваннем драмы беларусаў-эмігрантаў. У лірыцы амер. перыяду дамінуюць матывы настальгіі па Беларусі. У 1940-я г. напісала лібрэта да опер М.Шчаглова «Лясное возера», «Усяслаў Чарадзей». Пераклала на бел. мову драму Г.Гаўптмана «Патанулы звон», камедыю Г.Клейста «Разбіты збан», урыўкі з трагедыі У.Шэкспіра «Рамэо і Джульета» і паэмы А.Міцкевіча «Дзяды», вершы Міцкевіча і Гётэ, лібрэта опер В.А.Моцарта «Вяселле Фігара», «Чарадзейная флейта», К.М.Вебера «Вольны стралок», Ж.Бізэ «Кармэн», часткова оперы П.Чайкоўскага «Яўген Анегін», аперэты І.Штрауса «Цыганскі барон».

*Тв.:* Пад сінім небам: Вершы (1921—1925 г.). Вільня, 1927 (факс. выд. Мн., 1991); Сягоння: Вершы, 1941—1943. Мн., 1944; Між берагамі: Выбар паэзіі, 1920—1970. Нью-Йорк; Таронта, 1979; У кн.: Туга па Радзіме: Паэзія бел. эміграцыі. Мн., 1992.

*Літ.:* Сачанка Б. Сняцца сны аб Беларусі... Мн., 1990. С. 43—48; Мішанчук М. «Між берагамі» // Культура беларускага замежжа. Мн., 1993. Ч. 1; Тарасюк Л. Праз акіян забыцця // ЛіМ. 1993. 5 лют.; Ясж. Пад небам паэзіі // Полымя. 1995. №6; Сямёнава А. Лёс — і над лёсам // Голас Радзімы. 1993. 30 верас.; Калеснік У. Наталля Арсеннева // ЛіМ. 1994. 9 снеж. *Л.К.Тарасюк.*

**АРСЕ́НЬЕЎ** Віктар Васілевіч (н. 26.12.1950, Брэст), бел. архітэктар. Скончыў Брэсцкі інж.-буд. ін-т (1972). Працаваў у ін-це «Брэстграмадзянпраект» (1972—86), з 1986 гал. архітэктар Пецярбургскага праектнага ін-та №3. Асн. работы ў Брэсце: будынак рэдакцыі і выдавецтва газ. «Заря» (1980), забудова мікрараёна Усход 3 (1986), аэравакзал (1986; Дзярж. прэмія Беларусі 1988) і інш.

**АРСЕ́НЬЕЎ** Канстанцін Іванавіч (23.10.1789, в. Міроханава Кастрамской губ. — 11.12.1865), рускі географ, статыстык. Акад. Пецярбургскай АН (1836). Праф. Пецярбургскага ун-та (1819—21). У 1828—35 выкладаў гісторыю і статыстыку будучаму рас. імператару Аляксандру II. Адзін з заснавальнікаў Рус. геагр. т-ва. Навук. працы па статыстыцы, эканам. раянаванні Расіі і геаграфіі.

*Тв.:* Начертание статистики Российского государства. Ч. 1. О состоянии народа. Спб., 1818. Ч. 2. О состоянии правительства. Спб., 1819; Краткая всеобщая география. Спб., 1818; Статистические очерки России. Спб., 1848.

**АРСЕ́НЬЕЎ** Уладзімір Клаўдзіевіч (10.9.1872, С.-Пецярбург — 4.9.1930), пісьменнік, даследчык Д. Усходу, этнограф. У 1902—03 і 1906—12 як афіцэр-тапограф ажыццявіў шэраг экспедыцый па Пд Прымор'я і Сіхатэ-Аліні. Падарожнічаў па Камчатцы (1913), правабярэжжы Амура (1926), па маршруце Сав. Гавань — Хабараўск (1927). Працаваў у ВНУ Д. Усходу. Апісаў прыроду і побыт жыхароў даследаваных ім мясцін.

*Тв.:* Бел. пер. — У нетрах Усурыйскага краю. Мн., 1929; Дэрсу Узала. Мн., 1935; Па Усурыйскаму краю: (Падарожжа ў горную вобласць Сіхатэ-Алінь у 1902—1906 гг.). Мн., 1952.

**АРСЛАНКУ́ЛАЎ** Ташпулат (1882—10.5.1962), узбекскі майстар разьбы па ганчы. Нар. мастак Узбекістана (1944). Удзельнічаў у афармленні будынкаў у Ташкенце (адзін з афарміцеляў інтэр'ераў Вял. т-ра оперы і балета імя А.Наваі, 1947—48; Дзярж. прэмія СССР, 1948).

**АРСУКІ́СДЗЕ** (Арсакісдзе), грузінскі дойлід 10 — пач. 11 ст. Будаўнік аднаго з самых вялікіх груз. сярэдневяковых храмаў — *Светы-Цхавелі* ў Мцхета (1010—29).

**АРТА...** (ад грэч. orthos прамы, правільны), першая састаўная частка складаных слоў, якая адпавядае паняццям «прамы», «правільны», напр., *артаклаз, артадантыя.*

**АРТАБАЛЕ́ЎСКІ** Іван Іванавіч (9.10.1905, Масква — 21.9.1977), савецкі вучоны ў галіне тэорыі машын і механізмаў. Акад. АН СССР (1946). Герой Сац. Працы (1969). Засл. дз. нав. і тэхн. РСФСР (1945). Скончыў Маскоўскую с.-г. акадэмію імя К.А.Ціміразева (1926). З 1927 выкладаў у ВНУ Масквы, у 1932—49 праф. Маскоўскага ун-та, з 1937 у Ін-це машыназнаўства АН СССР. Распрацаваў класіфікацыю прасторавых механізмаў і вызначыў метады іх кінематычнага аналізу. Вывучаў праблемы тэарэт. і эксперым. метадаў даследавання дынамікі рабочых машын, стварыў новыя метады выпрабавання машын-аўтаматаў. Прэмія імя П.П.Чабышова АН СССР (1946), сярэбраны медаль Чэхаславацкай АН (1966), міжнар. залаты медаль імя Дж.Уата Ін-та інжынераў-механікаў (Англія, 1967).

*Літ.:* И.И.Артоболевский: [Биобиблиогр.]. 2 изд. М., 1975.

**АРТАВА́ЗД II** (? — 31 да н.э.), цар *Арменіі Вялікай* у 56—34 да н.э., сын *Тыграна II.* Пашырыў тэр. краіны, далучыў да яе Сафену і *Арменію Малую.* Вёў барацьбу з Рымам за незалежнасць. Аднак пазней быў вымушаны зноў падпарадкавацца Рыму. У 37 да н.э. адмовіўся ўдзельнічаць у паходзе рымлян супраць Парфіі. Захоплены рымлянамі і пакараны смерцю. Вядомы як драматург і гісторык.

**АРТАГАНА́ЛЬНАЕ ПЕРАЎТВАРЭ́ННЕ,** лінейнае пераўтварэнне *эўклідавай прасторы,* якое захоўвае нязменным скалярны здабытак адвольных вектараў з гэтай прасторы: (Ах, Ау) = (х, у). Захоўвае даўжыні вектараў і вуглы паміж імі, пераводзіць артанармоўны базіс у артанармоўны (гл. *Артаганальная сістэма*), у якім А.п. адпавядае артаганальная *матрыца* з дэтэрмінантам роўным +1 (уласнае А.п.) або -1 (няўласнае А.п.). Напр., паварот вакол восі ў трохмернай эўклідавай прасторы — уласнае А.п., здабытак павароту вакол восі і адбіцця ў перпендыкулярнай плоскасці — няўласнае. *В.А.Ліпніцкі.*

**АРТАГАНА́ЛЬНАСЦЬ** (*ад арта...* + грэч. gonia вугал), абагульненне паняцця *перпендыкулярнасці* на розныя аб'екты матэматыкі. Так, перпендыкулярнасць дзвюх прамых абагульняецца на А. ліній (вугал паміж крывымі роўны вуглу паміж датычнымі ў пункце перасячэння), А. траекторый (перасячэнне імі пад прамым вуглом зададзенай сям'і ліній, напр., сям'я радыяльных прамых перасякае пад прамым вуглом акружнасць) і А. вектараў (роўнасць нулю іх скалярнага здабытку) — на любую вектарную прастору, дзе вызначана паняцце скалярнага здабытку са звычайнымі ўласцівасцямі і інш. Гл. таксама *Артаганальная сістэма.*

*В.А.Ліпніцкі.*

**АРТАГАНА́ЛЬНАЯ ПРАЕ́КЦЫЯ,** гл. ў арт. *Праекцыя.*

**АРТАГАНА́ЛЬНАЯ СІСТЭ́МА,** 1) мноства $\{x_n\}$ ненулявых вектараў у эўклідавай (гільбертавай) прасторы, для якіх скалярны здабытак $(x_n, x_m) = 0$ пры $n \neq m$. Калі модуль кожнага вектара роўны 1, то сістэма $\{x_n\}$ наз. артанармоўнай. Поўную А.с. наз. артаганальным базісам. Адпаведна вызначаецца і артанармоўны базіс. 2) Сістэма каардынатаў, у якой каардынатныя лініі (або паверхні) перасякаюцца пад прамым вуглом. Звычайна карыстаюцца дэкартавымі, палярнымі, эліптычнымі,

сферычнымі, цыліндрычнымі А.с. кардынатаў. 3) Сістэма *мнагаскладаў* $\{P_n(x)\}$, n = 0, 1, 2, ..., якія на адрэзку [a, b] з вагой g(x) задавальняюць умовам артаганальнасці $\int_a^b P_n(x)P_m(x)g(x)dx = 0$ /n≠m/, пры гэтым ступень кожнага мнагасклада $P_n(x)$ супадае з яго індэксам n. Выкарыстоўваюцца ў задачах матэм. фізікі, тэорыі выяўленняў груп, вылічальнай матэматыкі і інш. 4) Сістэма функцый $\{\varphi_n\}$, n = 1, 2..., якія на адрэзку [a, b] з вагой p(x) задавальняюць умовам артаганальнасці: $\int_a^b \varphi_n(x)\varphi_m^*(x)p(x)dx = 0$ пры n≠m, дзе * — знак камплекснай спалучанасці. Напр., сістэма трыганаметр. функцый $1/2$, cos nπx, sin nπx (n = 1, 2, ...) — А.с. на адрэзку [-1,1] з вагой 1. Выкарыстоўваецца для рашэння задач, напр., спектральнага аналізу ў тэорыі ваганняў, акустыкі, радыёфізікі, оптыкі. *В.А.Ліпніцкі.*

**АРТАДА́НТЫЯ** [ад *арта...* + грэч. odus (odontos) зуб], раздзел *стаматалогіі*, які вывучае дыягностыку, лячэнне, прафілактыку анамалій развіцця і дэфармацый зубоў, зубных радоў і сківіц у дзяцей і дарослых. Функцыянальныя расстройствы зубна-сківічнай сістэмы парушаюць дзейнасць і выклікаюць захворванні органаў стрававання і дыхання. Касметычныя недахопы і дэфекты мовы фарміруюць у дзяцей маўклівасць, замкнёнасць, што можа прывесці да адставання ў развіцці псіхікі. Лячэнне пачынаюць з ранняга ўзросту; адвучаюць дзіця ад шкодных звычак (ссанне пальца, языка, цацкі). Пры выражаных анамаліях зубна-сківічнай сістэмы выкарыстоўваюць артадантычныя апараты. Лячэнне ад некалькіх месяцаў да года і больш. *А.С.Арцюшкевіч.*

**АРТАДО́КСІЯ** (ад грэч. orthodoxia правільная думка), цвёрдая паслядоўнасць, прыхільнасць да традыцый, асноў якога-небудзь вучэння, светапогляду, якая цалкам выключае нават нязначныя адхіленні. А. ў рэлігіі — прававер'е, няўхільнае прытрымліванне традыцыйнага вучэння царквы.

**АРТАЗІ́ДЫ** (Ortheziidae), чарвяцы, група найб. прымітыўных хобатных насякомых атр. раўнакрылых. Больш за 1,6 тыс. відаў. Жывуць пераважна ў тропіках і субтропіках. На Беларусі кашаніль польская занесена ў Чырв. кнігу.

Даўж. ад некалькіх мм да 1 см. На целе ў маладых і дарослых спінны шчыт з воска- і смолападобных рэчываў сакрэту скурных залоз. Галава звычайна з добра развітымі вусікамі і вачамі. Ногі адна- або двухчленікавыя з кіпцюром на канцы. Лічынкі («бадзяжкі»), выходзячы з-пад матчынага шчытка або яйцавага мяшка распаўзаюцца ў розных напрамках ці пераносяцца ветрам. Жывуць на раслінах, кормяцца іх сокам. Рэзка выяўлены палавы дымарфізм. Самка бяскрылая, лічынкападобная, самцы крылатыя. Многія з мучністых А. — шкоднікі раслін, асабліва субтрапічных (напр., цытрусавых). Ёсць каштоўныя: А. лакавыя даюць ізаляцыйны матэрыял шэлак, кермесы — чырв. фарбу кармін. Некаторыя ахоўваюцца.

**АРТАКЛА́З** (ад *арта...* + грэч. klasis трэшчына), мінерал з групы *палявых шпатаў*, $K[AlSi_3O_8]$. Прымесі натрыю, радзей барыю, жалеза, кальцыю і інш. Крышталізуецца ў манаклінной сінганіі. Крышталі прызматычныя (характэрны двайнікі), агрэгаты зярністыя. Бясколерны, белы, шэры, ружовы, чырванаваты і інш. Бляск шкляны. Цв. 5—6,5. Шчыльн. каля 2,6 г/см$^3$. Празрыстыя крышталі А., найб. чыстыя паводле саставу, наз. *адулярам*. Паходжанне магматычнае, часткова метамарфічнае; пародаўтваральны мінерал гранітаў, сіенітаў, гнейсаў і інш. На Беларусі пашыраны ў антрапагенных адкладах розных генетычных тыпаў. Выкарыстоўваецца ў шкляной і керамічнай прам-сці.

Да арт. Артазіды. Кашаніль польская: 1 — самец; 2 — самка.

**АРТАКСЕ́РКС I** Даўгарукі, персідскі цар [465—424 да н.э.]. З дынастыі *Ахеменідаў*. Уступіў на трон пасля забойства ў выніку прыдворнай змовы яго бацькі — Ксеркса I. На пач. царавання задушыў паўстанне егіпцян, якое падтрымлівалі Афіны. У 454 да н.э. персы знішчылі флот афінян у дэльце Ніла. У 449 да н.э. заключыў Каліеў мір, якім завершаны грэка-персідскія войны і зафіксаваны разгром персаў.

**АРТАКСЕ́РКС II** Мнемон, персідскі цар [404—358 да н.э.]. З дынастыі *Ахеменідаў*. На пач. праўлення вёў барацьбу за трон з малодшым братам Кірам, правіцелем М.Азіі. Нягледзячы на поспехі ў знешняй палітыцы (разграміў спартанскі флот каля Кніда ў 394 да н.э., заключыў *Анталкідаў мір* 387 да н.э.), праўленне А. II — перыяд аслаблення *Ахеменідаў дзяржавы*.

Артаклаз.

**АРТАКСЕ́РКС III** Ох, персідскі цар [358—338 да н.э.]. З дынастыі *Ахеменідаў*, сын *Артаксеркса II*. Стаў царом пасля знішчэння старэйшых братоў. Імкнуўся аднавіць цэласнасць і магутнасць *Ахеменідаў дзяржавы*, жорстка душыў паўстанні ў М.Азіі, Фінікіі, на Кіпры. У 341 да н.э. зноў далучыў да сваёй дзяржавы Егіпет. Забіты сваім прыбліжаным еўнухам Багоем.

**АРТАМО́НАВА** (Вароніна) Інга Рыгораўна (29.8.1936, Масква — 4.1.1966), расійская спартсменка (канькабежны спорт). Засл. майстар спорту СССР (1962). Чатырохразовая чэмпіёнка свету (1957—58, 1962, 1965), сярэбраны прызёр чэмпіянатаў свету (1963, 1964), неаднаразовая рэкардсменка свету, чэмпіёнка СССР у многаборстве (1956, 1958, 1962—64), шматразовая чэмпіёнка СССР (1956—59, 1961—65) на розных дыстанцыях.

**АРТА́НІЯ**, Арсанія, Арта, адзін з трох раннефеадальных цэнтраў Стараж. Русі 8—9 ст. Упамінаецца разам з Куявіяй (Кіеўская зямля) і Славіяй (наўгародскія, ці ільменскія, славяне) араб. і перс. географамі. Адны з даследчыкаў атаясамліваюць А. з тэр. *антаў*, другія — з Тмутараканню, трэція — з гарадамі Рязань ці Чарнігаў. Ёсць меркаванне, што А. мае дачыненне да тэр. Беларусі і, магчыма, знаходзілася недзе на рацэ Рша (сучасная Аршыца, прыток Дняпра), на скрыжаванні падняпроўскіх гандл. шляхоў; арабскае напісанне Арсанія атаясамлівалі з Аршаніяй (ад Орша, Рша).

**АРТАПЕДЫ́Я** [ад *арта...* + грэч. pais (paidos) дзіця], галіна медыцыны, якая вывучае прадухіленне, распазнаванне і лячэнне захворванняў, дэфармацый і вынікаў пашкоджанняў апорна-рухальнай сістэмы. Разам з *траўматалогіяй* складае адзіную ўрачэбную спецыяльнасць.

Заснавальнік навук. А. — франц. ўрач Н.Андры (N.Andre), які ў 1741 увёў гэты тэрмін. Класічныя апісанні пашкоджанняў і захворванняў органаў апоры і руху і рэкамендацыі па іх лячэнні трапляліся яшчэ ў працах Гіпакрата і Ібн-Сіны. У пач. 16 ст. франц. ўрач А.Парэ распрацаваў метады ампутацыі канечнасцяў і прапанаваў апараты для выкарыстання іх пры артапедычных захворваннях. Прагрэсу А. ў Расіі садзейнічалі працы Я.В.Мухіна (1806) пра асновы лячэння пераломаў і вывіхаў, М.І.Пірагова (1840), які распрацаваў вучэнне аб працэсах рэгенерацыі пасля аперацыі ахілавага сухажыллля, увёў не-

рухомую гіпсавую павязку і інш. Працы М.П.Нікольскага (1870), М.Ф.Руднева (1880) садзейнічалі прагрэсу касцёва-пластычнай хірургіі, працы В.І.Разумоўскага, М.І.Студэнцкага, В.М.Шаўкуненкі (канец 19 — пач. 20 ст.) — развіццю артапедычных аперацый пры артрадэзіі, астэаміі, касалапасці. Пад кіраўніцтвам заснавальніка сістэмы артапедычнай дапамогі ў краінах б. СССР М.М.Прыёрава створаны Лячэбна-пратэзны ін-т (1921), метадычны цэнтр па А. і траўматалогіі.

В.Артмане.

На Беларусі асобныя пытанні А. пачалі вывучаць у 19 — пач. 20 ст. У ліку першых у Еўропе К.І.Гібенталь выкарыстаў гіпс для фіксацыі зламанай канечнасці (1812). Сістэматычныя даследаванні па А. вядуцца з 1930-х г. у Бел. НДІ траўматалогіі і артапедыі, Бел. ін-це ўдасканалення ўрачоў, на адпаведных кафедрах мед. ін-таў. Развіццю А. садзейнічалі працы М.Н.Шапіры, Б.Н.Цыпкіна, В.А.Маркса, Р.Х.Мінінай, І.Р.Варановіча, А.С.Крука, А.У.Руцкага, С.С.Навумовіча, А.А.Губко, А.М.Сакалоўскага і інш. Асн. кірункі даследаванняў: прафілактыка і лячэнне артапедычных захворванняў і траўмаў, распрацоўка метадаў і сродкаў мед. рэабілітацыі хворых і інвалідаў з прычыны ўскладненых пашкоджанняў касцей і суставаў, хірургічнага лячэння пухлін, ліквідацыі вынікаў дэгенератыўна-дыстрафічных працэсаў у касцях і суставах, эндапратэзаванне, удакладненне пытанняў дыягностыкі.

*Літ.:* Маркс В.О. Ортопедическая диагностика. 2 изд. Мн., 1978; Травматология и ортопедия. 3 изд. М., 1990; Волков М.В. Болезни костей у детей. 2 изд. М., 1985.

**АРТАША́Т**, горад, у 2 ст. да н.э. — сярэдзіне 5 ст. н.э. сталіца стараж. *Арменіі Вялікай*. Заснаваны каля 176 да н.э. *Арташэсам I*, які сталіцу дзяржавы з *Армавіра* перанёс у пабудаваны ім А. У 58 і 163 н.э. разбураны рымлянамі, у 364—68 — іранцамі. Прыйшоў у заняпад у сувязі з пераносам сталіцы Арменіі ў Дзвін. Знаходзіўся паблізу сучаснага арм. г. Арташат.

**АРТАШЭ́С I**, Артаксій (? — 160 да н.э.), цар *Арменіі Вялікай* [189—160 да н.э.]. У 190 узначаліў паўстанне армян супраць *Селеўкідаў*, абвясціў незалежнасць дзяржавы і стаў заснавальнікам дынастыі Арташэсідаў. Умацаваў і пашырыў свае ўладанні, сталіцу з Армавіра перанёс ў пабудаваны ім г. *Арташат*. Правёў рэформу, якая ўмацавала прыватную ўласнасць на зямлю.

**А́РТМАНЕ** (Artmane) Вія (сапр. Аліда Фрыцаўна; н. 21.8.1929, г. Тукулес, Латвія), латышская актрыса. Нар. арт. СССР (1969). Скончыла студыю пры Латышскім маст. т-ры імя Я.Райніса (Рыга), працуе ў гэтым т-ры. З 1956 здымаецца ў кіно. Драматычная актрыса. Мастацтва А. адметнае лірызмам, шчырасцю, стрыманасцю, якія спалучаюцца з унутр. напоўненасцю і эмацыянальнасцю. Сярод тэатр. роляў: Афелія, Джульета («Гамлет», «Рамэо і Джульета» У.Шэкспіра), Лаймдота («Агонь і ноч» Райніса). З лепшых работ у кіно: Соня («Родная кроў»), Она («Ніхто не хацеў паміраць»), Крысціна («Эдгар і Крысціна»), Джулія Ламбэрт («Тэатр» паводле С.Моэма, тэлевіз.). Пра А. зняты дакументальны фільм «Размовы з каралевай». Дзярж. прэмія Латвіі 1980.

Артотрыхум Лаеля: *а* — вывадковыя цельцы; *б* — ліст; *в* — верхняя частка сцябла з каробачкай.

**АРТО́** (Artôt) Маргерыт Жазефін Дэзірэ (21.7.1835, Парыж — 3.4.1907), французская спявачка (мецца-сапрана і сапрана). Выконвала партыі драм. і каларатурнага сапрана, у іх ліку Віялета («Травіята» Дж.Вердзі), Маргарыта («Фауст» Ш.Гуно), Фідэс («Прарок» Дж.Меербера). Выступала ў многіх краінах, у т.л. ў Расіі. П.І.Чайкоўскі прысвяціў А. «Раманс» f-moll для фп. і 6 рамансаў для голасу і фп.

**АРТО́ТРЫХУМ** (Orthotrichum), род брыевых імхоў сям. артотрыхавых. Каля 200 відаў. Пашыраны пераважна ва ўмераных шыротах. На Беларусі 15 відаў, з іх А. прыгожы (O. speciosum) трапляецца часта, А. Лаеля (O. layelii) занесены ў Чырв. кнігу. Растуць на кары дрэў, камянях, мураваных і бетонных збудаваннях. Ксераморфныя расліны, вытрымліваюць працяглае высыханне.

Падушачкі ад цёмна-зялёных да карычневых. Сцябло 0,5—7 см даўж., прамастойнае або прыўзнятае, разгалінаванае, густа ўкрытае лісцем. Лісце яйцападобна- або лінейна-ланцэтнае, з простай жылкай. Каробачка на кароткай ножцы, з 8—16 прадаўгаватымі палоскамі, радзей без іх. Вечка конусападобнае з дзюбкай. Перыстом двайны.

**АРТРАДЫ́РЫ**, членісташыйныя (Arthrodira, або Coccostei), падклас вымерлых марскіх і прэснаводных храстковых рыб кл. пласцінаскурых. 11 атрадаў. Выяўлены ў адкладах познягасілуру — познягa дэвону ўсіх мацерыкоў, на Беларусі — у Аршанскай упадзіне ў лагунна-марскіх адкладах сярэдняга дэвону. Тыповыя прадстаўнікі А. — плаурдастэусы.

Даўж. да 6 м. Форма цела і памеры разнастайныя. Шкілет храстковы. Галава і пярэдняя ч. тулава ўкрытыя касцявым панцырам, які ўтвораны касцямі вонкавага плечавога пояса. Сківіцы ў выглядзе касцявых пласцін з рэжучымі краямі і біўнепадобнымі выступамі. Грудныя плаўнікі пад касцявымі шыпамі. Хвост звычайна голы. Прыдонныя драпежнікі.

**АРТРАПЛА́СТЫКА** (ад грэч. arthron сустаў + *пластыка*), аперацыі па аднаўленні функцый сустава пры *анкілозах, артрозах*, няправільным зрастанні ўнутрысустаўных пераломаў. Асн. этапы: раз'яднанне сустаўных канцоў, мадэляванне новых сустаўных паверхняў і размяшчэнне паміж імі пракладак са скуры або фасцыі хворага. Выкарыстоўваюць таксама каўпачкі з храсткоў або плодных абалонак, кансерваваныя канцы касцявых суставаў, штучныя метал. або пластмасавыя суставы ці галоўкі суставаў. Пасля А. патрабуецца працяглае функцыянальнае лячэнне, фізіятэрапія, масаж.

**АРТРАСПО́РЫ**, дыяспоры вегетатыўнага размнажэння грыбоў, тое, што *аідыі*.

**АРТРО́З** (ад грэч. arthron сустаў + ...*оз*), хранічная дыстрафічна-дэгенератыўная хвароба суставаў чалавека. Абумоўлена парушэннем жыўлення эпіфізарных канцоў касцей. Прычыны ўзнікнення А. — хваробы абмену рэчываў, інтаксікацыі, інфекцыі, траўмы, трафанеўрозы. Прыкметы: боль, хруст, абмежаваная гнуткасць, дэфармацыя, змены ў сучленены паверхнях суставаў. Лячэнне медыкаментознае, фізіятэрапеўтычнае, у цяжкіх выпадках хірургічнае.

**АРТРЫ́Т** (ад грэч. arthron сустаў + ...*іт*), зборная назва запаленчых і запаленча-дыстрафічных, а ў шырокім сэнсе і інш. хвароб *суставаў*. Адрозніваюць А. першасныя (напр., спандылаартрыт) і другасныя або спадарожныя (пасля рэўматызму), вострыя і хранічныя, лакалізаваныя ў адным суставе і множныя (*поліартрыт*). Выклікаюцца інфекцыяй пры туберкулёзе, бруцэлёзе, парушэннямі абмену рэчываў і жыўлення суставаў, траўмамі і інш. Прыкметы: боль у суставах, пачырваненне скуры над імі, абмежаваная гнуткасць, змена формы суставаў, прыпухласць. Лячэнне меды-

каментознае, санаторна-курортнае, пры цяжкіх ускладненнях хірургічнае.

**«АРТ-СЕ́СІЯ»**, мастацкая акцыя, якая ўключае правядзенне конкурсу-выставы візуальных мастацтваў творчай моладзі і фестывальную харэаграфічную праграму. Праводзіцца з 1992 штогод у Віцебску. У выстаўцы ўдзельнічаюць студэнты маст. спецыяльнасцяў ВНУ Віцебска (факультэты мастацкаграфічны, педагогікі і методыкі пач. навучання, музыкі і выяўл. мастацтва пед. ін-та, маст. канструявання вырабаў лёгкай прам-сці тэхнал. ін-та) і вучні маст. аддзяленняў вучылішчаў. Экспазіцыя выстаўкі ўключае раздзелы: жывапіс, графіка, дызайн, скульптура, дэкар.-прыкладное мастацтва, мадэлі адзення. *М.Л.Цыбульскі.*

**АРТУА́** (Artois), гістарычная вобласць на Пн Францыі, асн. частка дэпартамента Па-дэ-Кале. Пл. каля 4 тыс. км$^2$. Нас. 1 млн. чал. (1982). З 2-й пал. 9 ст. да 1180 тэр. А. належала Фландрыі; у сярэднія вякі частка аўстр. і ісп. Нідэрландаў. Адышла да Францыі ў 1659. Гал. горад — Арас.

**АРТУКІ́**, вёска ў Беларусі, у Рэчыцкім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 27 км на Пд ад Рэчыцы, 77 км ад Гомеля, 25 км ад чыг. ст. Рэчыца. 2007 ж., 789 двароў (1994). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызанаў.

**АРТЫ́ГАС** (Artigas) Хасе Хервасіо (19.6.1764, Мантэвідэо — 23.9.1850), уругвайскі ваенны і паліт. дзеяч, нац. герой Уругвая. Служыў у ісп. калан. войсках. У 1811—14 узначальваў нар. паўстанне Усх. берага (сучасны Уругвай) супраць ісп. панавання. Выступаў за незалежнасць Уругвая, супраць далучэння яго да Аргенціны. У 1816—20 вёў барацьбу супраць браз. агрэсіі. У 1820 пацярпеў паражэнне ад партуг.-браз. войскаў і інтэрніраваны ў Парагваі.

**АРТЫ́КЛЬ** (франц. article), службовае слова, якое выкарыстоўваецца ў германскіх, раманскіх і інш. мовах як адзнака назоўніка. Выконвае розныя функцыі: вызначае катэгорыю пэўнасці (у англ. the; the city) і няпэўнасці (у англ. a; a village), катэгорыі роду (у ням. м.р. der, ж.р. die, н.р. das), ліку [у франц. адз.л. le, la (un, une) — мн. les, (des)], склону (у ням. у назоўнікаў мужчынскага роду Н.скл. der, Р.скл. des, Д.скл. dem, М.скл. den). Бываюць прэпазіцыйныя (перад словамі, да якіх адносяцца; у герм. і раманскіх мовах) і постпазіцыйныя (пасля гэтых слоў; у некаторых слав. мовах).

**АРТЫКО́Н** (ад грэч. orthos прамы + eikōn выява),, перадавальная тэлевізійная трубка з назапашваннем зараду і счытваннем відарыса павольнымі (каэфіцыент другаснай эмісіі < 1) электронамі. Распрацаваны амер. інжынерамі А.Розам і Х.Ямсам (1939). Прыкладна ў 20 разоў больш адчувальны за *іканаскоп*; характарыстыка «святло—сігнал» лінейная ва ўсім дыяпазоне ўстойлівай работы. Выкарыстоўваецца ў тэлевізійных перадавальных камерах. Гл. таксама *Суперартыкон.*

**АРТЫ́КУЛ** (ад лац. articulus артыкул, раздзел), 1) невялікі (бывае і значны памерам) навуковы, публіцыстычны або літ.-крытычны твор у газеце, часопісе, зборніку, кнізе. 2) У праве — асобная самаст. частка нарматыўнага акта, у якой найчасцей змешчана адна юрыд. норма, адно абавязковае правіла. На Беларусі падзел нарматыўных актаў на паасобныя А. практыкаваўся са старажытнасці, але тэрмін «А.» стаў ужывацца ва «Уставе на валокі» 1557, а потым і ў Статутах 1566 і 1588. З часам і асобныя законы пачалі называць А. 3) У бухгалтарскім уліку і фін. планах — раздзел, які змяшчае назвы крыніц прыбытку і мэтавага прызначэння фінансавых затрат.

**АРТЫ́КУЛ ВО́ІНСКІ**, першы вайсковакрымінальны і вайскова-працэсуальны кодэкс Расіі. Распрацаваны ў перыяд стварэння Пятром I рэгулярнай арміі. Выдадзены ў 1715. Нормы А.в. выкарыстоўваліся ў агульнацывільных судах. Дзейнічаў да выдання ў 1839 вайсковакрымінальнага статута.

Паводле А.в. найб. цяжкімі злачынствамі лічыліся здрада, замах на воінскіх начальнікаў, невыкананне загаду, дзеянні супраць дзяржавы, арміі і інш. А.в. прадугледжваў меры пакарання: біццё бізунамі, шпіцругэнамі, клеймаванне жалезам, высылку на катаргу, пакаранне смерцю і інш. А.в. змяшчаў таксама артыкулы аб вартаўнічай ахове, у яго была ўнесена воінская прысяга і інш. У 18—19 ст. артыкулам называлі, акрамя таго, параграф статута, а таксама ружэйныя прыёмы.

**АРТЫ́КУЛЫ ВАЙСКО́ВЫЯ** (гетманскія), вайсковыя законы, пастановы і распараджэнні, якія дзейнічалі ў ВКЛ у 16—18 ст. Зацвярджаліся соймам або асабіста гетманамі.

Былі першымі дысцыплінарнымі і баявымі статутамі арміі, а таксама зборнікамі вайскова-крымінальнага права. У артыкулах і інш. юрыд. актах пра вайск. службу вызначаўся парадак камплектавання, размяшчэння, забеспячэння і падпарадкавання арміі. Першая спроба кадыфікаваць нормы вайск. права Беларусі зроблена пры складанні *Статута Вялікага княства Літоўскага 1529.* У 1754 у Нясвіжы зроблена першае сістэматызаванае выданне актаў па вайск. праве Беларусі.

**АРТЫ́КУЛЫ КАНФЕДЭРА́ЦЫІ** (The articles of Confederation), першая канстытуцыя ЗША. Прынята ў ліст. 1777, дзейнічала ў 1781—89. Замацавала заваяванні, дасягнутыя ў час *Вайны за незалежнасць у Паўночнай Амерыцы 1775—83*, і вызначыла рэсп. форму дзярж. ўпарадкавання б. англ. калоній у Паўн. Амерыцы, абвясціўшы ўтварэнне канфедэрацыі і вечны саюз штатаў.

**АРТЫКУЛЯЦЫ́ЙНАЯ БА́ЗА МО́ВЫ**, гл. ў арт. *Артыкуляцыя.*

**АРТЫКУЛЯ́ЦЫЯ** (ад лад. articulo расчляняю), 1) у мовазнаўстве — работа органаў мовы (губ, языка, мяккага паднябення, галасавых звязак), з дапамогай якіх утвараюцца гукі мовы. Сукупнасць А. складае артыкуляцыйную базу мовы. Правільнае (без акцэнту) вымаўленне слоў чужой мовы патрабуе засваення яе артыкуляцыйнай базы. Паводле ступені выразнасці маўлення ацэньваюць якасць вымаўлення асобных людзей (пры адборы дыктараў, чытальнікаў, акцёраў і інш.) і каналаў сувязі.

У бел. артыкуляцыйнай базе пераважаюць А. з высокім становішчам языка, апусканнем да ніжніх зубоў кончыка языка пры вымаўленні мяккіх зычных «дз'», «ц'» (дзеканне-цеканне), а таксама «з'», «с'», «н'», «л'», ад чаго яны робяцца мякчэйшыя за, напр., адпаведныя рус. гукі. Спецыфічна бел. асаблівасці: губна-губная А. пры вымаўленні «в» пасля галосных і перад «у», «о»; працяжнае вымаўленне «г»; наяўнасць значнай колькасці змычна-шчылінных А. («дж», «дз», «ч», «ц», «ц'», «дз'»). А. суседніх гукаў накладваюцца і прыстасоўваюцца адна да адной (*акамадацыя*).

2) У музыцы — спосаб выканання паслядоўнасці гукаў голасам або на муз. інструменце. Вызначаецца злітнасцю або расчлянёнасцю. Асн. віды А. — *легата* і *стаката.* Іх разнавіднасці адрозніваюцца ступенню выразнасці і характарам выканання. Існуюць блізкія паміж сабою партамента і глісанда (лёгкае слізганне ад аднаго гуку да другога) і інш. Тэхнічна А. звязана з рознымі прыёмамі руху рукі, націску пальцаў, вядзення смычка або плектра, у спевах — са спосабам карыстання галасавым апаратам.

*А.І.Падлужны* (мовазнаўства).

**АРТЫЛЕ́РЫЯ** (франц. artillerie), 1) род войскаў, прызначаны для абслугоўвання і баявога выкарыстання артыл. *узбраення.* Ва ўсіх арміях свету выконвае баявыя задачы ў інтарэсах інш. родаў войскаў.

У сучасных сухапутных войсках падзяляецца на А. вайсковую (палявую) — армейскую, карпусную, палкавую і да т.п. і рэзерву Гал. камандавання, на наземную (бывае пушачная, гаўбічная, рэактыўная, процітанкавая, горная і мінамёты) і зенітную. Залежна ад спосабу арганізацыі ўзаемадзеяння з інш. родамі войскаў адрозніваюць А. прыдадзеную (на час выканання баявой задачы перадаецца ў распараджэнне камандзіра злучэння, часці) і А. падтрымкі (застаецца ў падначаленні ст. артыл. камандзіра, але выконвае агнявыя задачы, пастаўленыя агульнавайск. камандзірам). А. ў ВПС — авіяц. пушкі на самалётах і верталётах. У ВМФ падзяляецца на карабельную (у т.л. зенітную) і берагавую.

Ва Узбр. Сілах Рэспублікі Беларусь А. складаецца са злучэнняў, часцей і падраздзяленняў уласнаствольных артыл.

сістэм, процітанкавых кіроўных ракет, а таксама падраздзяленняў артыл. разведкі і спец. падраздзяленняў, што ўваходзяць у склад артыл. злучэнняў і часцей. Артыл. злучэнні і часці, што не належаць да вайсковай А., з'яўляюцца рэзервам Гал. камандавання і прызначаны для ўзмацнення дзеянняў агульнавайск. падраздзяленняў, а таксама для стварэння артыл. рэзерваў. 2) Від зброі або сукупнасць прадметаў артыл. ўзбраення, уключаючы сродкі наземнай і паветр. разведкі, сувязі, назірання, кіравання агнём, цягі, транспарту і інш. 3) Навука, якая вывучае асновы будовы матэрыяльнай часткі агнястрэльнай зброі, яе ўласцівасці і спосабы выкарыстання ў баі. Асн. раздзелы: унутраная і знешняя *балістыка*, асновы будовы матэрыяльнай часткі боепрыпасаў, выбуховыя сродкі і порахі, тэхналогія артыл. вытв-сці, тактыка, тэорыя стральбы, гісторыя А.

Самы ранні этап развіцця А. — сценабітная і кідальная зброя краін Стараж. Усходу (Егіпет, Індыя, Кітай і інш.), Грэцыі і Рыму. З вынаходствам пораху ўзнікла агнястрэльная зброя: у Кітаі ў 11 ст., у Еўропе першыя ўзоры яе з'явіліся ў Італіі, Францыі, Германіі, Англіі, на Беларусі — у 14 ст. Войскі ВКЛ упершыню сутыкнуліся з новай зброяй у 1341, калі ў час аблогі крыжацкага замка Баербург «вогненнай стралой» быў забіты вял. князь Гедзімін. У 1382 войскі ВКЛ ужо мелі ўласныя *бамбарды*, пры дапамозе якіх штурмавалі ордэнскі замак Георгенбург. Першыя гарматы рабілі з дрэва (Кітай, Галандыя), потым з жалеза ў выглядзе каванай метал. трубы, якая мацавалася да масіўнай драўлянай калодкі. Ядры напачатку былі драўляныя і каменныя, пазней алавяныя і бронзавыя. У 14 ст. з'явіліся гарматы з бронзы (на Беларусі іх выраблялі майстэрні ў Полацку, Віцебску, Навагрудку і інш.). У 1384 кідальныя балісты, зробленыя на Беларусі, выкарыстоўваліся супраць войскаў Лівонскага ордэна. Каля 1540 у Вільні заснаваны гарматны ліцейны двор — *людвісарня*, у 1597 — майстэрня па вытв-сці куль і ядраў *Бараньская кульня*. У 16—17 ст. гарматы ставілі на колы, у іх з'явіўся перадок з зараднай скрыняй. Ядры былі жалезныя, чыгунныя і нават шкляныя. Напачатку А. на Беларусі абслугоўвалі наёмныя пушкары з Германіі, Чэхіі, Галандыі (у іх вучыліся бел. майстры), з сярэдзіны 16 ст. абыходзіліся без іх. Вядомы імёны майстроў Сцяпана і Пятра з Нясвіжа (канец 16 — пач. 17 ст.), К.Ганусава з Быхава (2-я пал. 16 ст.) і інш. У 1-й пал. 17 ст. выпушчаны падручнікі па артыл. справе на лац. і польскай мовах: італьянца Андрэя дэль'-Аква, іспанца Дыега Уфана, ураджэнца Беларусі К. *Семяновіча*. У 18 ст. артыл. гарматы выраблялі ў Слуцку, Быхаве, Нясвіжы, Гродне, Жлобіне, Вішневе. Пасля далучэння Беларусі да Рас. імперыі выраб гармат спынены, эпізадычна для асобных магнатаў рабіліся невял. гарматы-салютоўкі. З сярэдзіны 19 ст. ў большасці краін пачаўся пераход да наразной А. У пач. 20 ст. артылерысты ўпершыню вялі стральбу з закрытых агнявых пазіцый, быў створаны і выкарыстаны мінамёт (1904—05). У перыяд 1-й сусв. вайны з'явілася А. суправаджэння, зенітная, процітанкавая, былі ўдасканалены мінамёты. 2-я сусв. вайна выклікала ўсебаковае развіццё зенітнай, процітанкавай, рэактыўнай і самаходнай А., выкарыстоўвалася А. вялікай і асаблівай магутнасці. Узніклі новыя формы баявых дзеянняў А., павялічылася яе шчыльнасць на ўчастках прарыву (да 200—300 гармат на 1 км фронту). Вопыт баявога выкарыстання А. даў багаты матэрыял для развіцця артыл. навукі. Удасканаленне А. працягваецца.

*Літ.:* Передельский Г.Е., Токмаков А.И., Хорошилов Г.Т. Артиллерия в бою и операции. М., 1980; Отечественная артиллерия, 600 лет. М., 1986; Nowak T. Polska technika wojenna XVI—XVIII w. Warszawa, 1970.

*М.Р.Плахотны, В.А.Юшкевіч.*

Да арт. **Артылерыя.** Ручная кідальная зброя даагнястрэльнай эпохі: 1, 2 — нервабалістычныя баявыя гарматы; 3, 4 — барабалістычныя гарматы (*а* — гіганцкіх памераў, *б* — з процівагай); 5 — акрабаліста (таксабаліста).

Да арт. **Артылерыя.** Гарматы 11 — пач. 20 ст.: 1 — старажытная кітайская драўляная гармата 11 ст.; 2 — марціра 14 ст.; 3 — доўгая французская серпанціна 15 ст.; 4 — гафуніца 1542; 5 — трохфунтовая палявая пушка 1700; 6 — бронзавая марціра Чохава 1606; 7 — «сакрэтная гаўбіца» Шувалава 1754; 8 — руская шасцідзюймовая аблогавая гармата 1877; 9 — 122-мм палявая скарастрэльная гаўбіца ўзору 1910; 10 — 76-мм зенітная пушка ўзору 1915.

**АРТЫМО́ВІЧ** Надзея Еўдакімаўна (н. 18.2.1946, в. Аўгустова Беластоцкага ваяв., Польшча), бел. паэтэса. Скончыла Варшаўскі ун-т (1982). З 1970 друкуецца ў беластоцкай газ. «Ніва». Першы зб. вершаў «У сне, у болю слова» (Беласток, 1979) выйшаў у пер. на польскую мову. У паэзіі пераважаюць інтымная лірыка, грамадска-патрыят. матывы, праблемы адаптацыі селяніна ў горадзе. Ёй характэрна ўскладненасць формы, метафарычнасць (зб. «Роздумы», Беласток, 1981; «Сезон у белых пейзажах», Беласток, 1990; «З неспакойных дарог», Мн., 1993; «Дзверы», Беласток, 1994, з А.Разанавым).

*Літ.:* Надзея Артымовіч // Крыніца. 1994. № 12.

*І.У.Саламевіч.*

**АРТЫ́Т** (ад грэч. orthos прамы, правільны), а л а н і т, рэдказямельны мінерал класа сілікатаў, аналаг *эпідоту*, $Ce_2Fe_2AlO(OH)[SiO_4]$ $[Si_2O_7]$. Крышталізуецца ў манаклінная сінганіі. Крышталі прызматычныя, таблітчастыя, агрэгаты зярністыя. Колер чорны, буры. Бляск смалісты. Цв. 5—6,5. Шчыльн. 3,3—4,2 г/см$^3$. Радыеактыўны. У прыродзе трапляецца рэдка. Акцэсорны мінерал гранітаў, гнейсаў, гранітных пегматытаў. Часта метаміктны. На Беларусі як акцэсорны мінерал выяўлены ў пародах крышт. фундамента. Сыравіна для атрымання рэдказямельных элементаў (цэзію, ітрыю і інш.). Выкарыстоўваецца для вызначэння абсалютнага ўзросту парод свінцовым метадам.

**АРТЫШО́К** (Cynara), род кветкавых раслін сям. астравых. Каля 12 відаў. Пашыраны ў Міжземнамор'і і на Канарскіх а-вах. У культуры 2 блізкія віды — А. кардон, або іспанскі (C. cardunculus), і сапраўдны, або калючы (C. scolymus). Як харч., кармавыя і дэкар. расліны вырошчваюць у Паўд. Еўропе, на Пд Расіі, на Украіне. На Беларусі А. сапраўдны ёсць у калекцыі Цэнтр. бат. сада АН. Размнажаюць насеннем і атожылкамі. У сярэдняй паласе вырошчваюць як аднагадовую культуру расадным метадам.

Шматгадовыя травяністыя расліны. Сцябло галінастае, прамое, выш. 0,5—1 м. Лісце буйное, лопасцевае або перыстарассечанае. Трубчастыя фіялетавыя, сінія або белыя кветкі сабраны ў буйны кошык дыям. да 10 см. Сакавітыя нераскрытыя кошыкі з мясістым кветаложам (маюць да 3% бялку, 7—15% вугляводаў, 3—11 мг% вітаміну С, 0,4 мг% караціну, вітаміны $B_1$ і $B_2$, правітамін А, цукар, інулін), ачышчаныя чаранкі, галоўныя жылкі лісця і карані спажываюць вараныя і кансерваваныя (далікатэсная страва). У насенні каля 30% тлушчу, прыдатнае на корм птушкам. Стымулявальны і дыўрэтычны лек. сродак; ужываюць пры дыябеце, атэрасклеро-

Да арт. **Артылерыя**. I. Гарматы 16—17 ст. з Нясвіжскага замка: 1, 2, 3 — з фігурнымі аздабленнямі, 4 — з серыі Германа Мольтфельда. II. Гарматы корпуса артылерыі ВКЛ канца 18 ст.: 1 — адна—трохфунтовая палявая гармата, зробленая на аўстрыйскі ўзор, 2 — двух—васьміфунтовая гаўбіца, зробленая на ўзор французскай гаўбіцы сістэмы Грыбаваля (лафет паказаны ў разрэзе). III. Адна з гармат польска-беларуска-літоўскіх паўстанцаў 1863—64 (паводле Баляслава Галэцкага).

розе, хваробах печані; плады — процяддзе опіуму.

**АРТЭ́ГА СААВЕ́ДРА** (Ortega Saavedra) Даніэль (н. 11.11.1945, г. Ла-Лібертад, Нікарагуа), дзяржаўны, палітычны і ваенны дзеяч Нікарагуа. Прэзідэнт Рэспублікі Нікарагуа ў 1985—90. З 1962 удзельнік барацьбы супраць дыктатуры Самосы, з 1965 чл. Нац. кіраўніцтва Сандзінісцкага фронту нац. вызвалення (СФНВ), у 1966—67 камандуючы Цэнтр. фронтам партыз. атрадаў. У 1975—79 адзін з кіраўнікоў узбр. сіл СФНВ. У 1981—85 каардынатар Кіруючага савета ўрада Нац. адраджэння.




Да арт. **Артылерыя.** Гарматы перыяду 1-й і 2-й сусветных войнаў: 1 — 155-мм палявая пушка (Францыя); 2 — 76-мм палявая скарастрэльная пушка ўзору 1902 (Расія); 3 — 210-мм аблогавая гаўбіца Крупа (Германія); 4 — 305-мм марціра (Аўстрыя); 5 — 105-мм гаўбіца (ЗША); 6 — шасціствольны мінамёт (Германія); 7 — 105-мм лёгкая гаўбіца (Германія); 8 — баявая машына рэактыўнай артылерыі БМ-13 (СССР); 9 — 76-мм самаходная артылерыйская ўстаноўка СУ-76 (СССР).

Да арт. **Артылерыя.** Сучасная артылерыя: 1 — 139,7-мм пушка МК-3 (Вялікабрытанія); 2 — баявая машына рэактыўнай артылерыі БМ-24 (Расія); 3 — 90-мм самарушная процітанкавая пушка (ФРГ); 4 — устаноўка рэактыўных кіроўных процітанкавых снарадаў 55-II (Францыя); 5 — 122-мм самаходная гаўбіца (Расія); 6 — 203-мм самаходная гаўбіца М 1101 Е2 (ЗША); 7 — 105-мм горная гаўбіца ўзору 1956 (Італія); 8 — 122-мм гаўбіца Д-30 (Беларусь).

**АРТЭЗІЯ́НСКІ БАСЕ́ЙН** (ад Artesium — лац. назвы франц. правінцыі Артуа), басейн напорных падземных водаў (гл. *Артэзіянскія воды*), прымеркаваны да адмоўных геал. структур. Адрозніваюць платформавыя А.б. (у сінеклізах, мульдах і інш.) і міжгорныя А.б. (у міжгорных прагінах). Утвараюцца пластавымі водамі платформавага чахла і трэшчынава-жыльнымі водамі крышт. фундамента. У А.б. вылучаюць вобласці жыўлення, напору і разгрузкі падземных водаў. Пл. ад дзесяткаў да мільёнаў квадратных кіламетраў. Самыя вял. А.б.: Заходне-Сібірскі, Маскоўскі (зах. ч. на тэр. Беларусі), Прыбалтыйскі, В. Аўстралійскі, Парыжскі і інш.

**АРТЭЗІЯ́НСКІ КАЛО́ДЗЕЖ**, калодзеж або свідравіна, з якіх атрымліваюць *артэзіянскія воды*. А.к. звычайна замацоўваюць трубамі, выкарыстоўваюць помпы, у зоне ваданоснага пласта абсталёўваюць фільтрамі. Многія нас. пункты Беларусі бяруць ваду з А.к. Водазабеспячэнне Мінска часткова грунтуецца на сістэмах артэзіянскіх свідравін глыб. у некалькі дзесяткаў метраў, часам больш за 100 м (дэбіт 50—100 м$^3$/гадз).

**АРТЭЗІЯ́НСКІЯ ВО́ДЫ**, напорныя пластавыя падземныя воды, якія залягаюць паміж водатрывалымі слаямі. Прымеркаваны да адмоўных геаструктур — сінкліналяў, мульдаў, прагінаў, упадзін. Напор узнікае пры гідраўлічнай ізаляванасці ваданосных гарызонтаў ад перавышэння вобласці жыўлення над вобласцю разгрузкі. Пры залішнім гідрастатычным ціску выліваюцца на паверхню зямлі або фантануюць пры ўскрыцці. Ва ўмовах актыўнага водаабмену А.в. прэсныя, застойных — салёныя ці рассолы (гл. *Мінеральныя воды*). А.в. звычайна звязаны з *артэзіянскімі басейнамі*. На Беларусі ўскрыты амаль на ўсёй тэр. на глыб. ад некалькіх дзесяткаў метраў да некалькіх кіламетраў, належаць да *Аршанскага гідрагеалагічнага басейна, Брэсцкага гідрагеалагічнага басейна, Прыпяцкага гідрагеалагічнага басейна* і Беларускага гідрагеалагічнага масіву. А.в. з'яўляюцца асн. крыніцай пітнога водазабеспячэння. *А.В.Кудзельскі.*

**АРТЭ́ЛІЙ** (Ortelius, Oertel) Абрахам (4.4.1527, Антверпен — 28.6.1598), фламандскі картограф і выдавец, адзін з заснавальнікаў картаграфічнай навукі. Каля 1547 заснаваў уласную фірму. Выдаў зб. «Агляд шара зямнога» («Theatrum orbis terrarum». Антверпен, 1570), які фактычна стаў першым геагр. атласам, змяшчаў 53 карты асобных краін з дэталёвымі апісаннямі (у т.л. бел. зямель), бібліягр. даведкі на 87 картографаў. «Агляд...» неаднаразова дапаўняўся і перавыдаваўся ў 17 — пач. 18 ст. У 1592 адкрыў у сваім антверпенскім доме музей, да канца жыцця займаўся гісторыка-геагр. даследаваннямі. *Л.Р.Казлоў.*

Артышок сапраўдны.

Схема будовы артэзіянскага басейна: 1 — ваданосны гарызонт; 2 — водатрывалыя слаі; 3 — узровень грунтавых водаў; 4 — свідравіны (*а* — без фантанавання, *б* — з фантанаваннем); *аб* і *вг* — вобласці жыўлення; *бв* — вобласць распаўсюджвання напорных водаў.

**АРТЭ́МІДА**, у грэчаскай міфалогіі багіня, дачка *Зеўса* і Леты, сястра-блізніца Апалона. Спачатку А. — апякунка жывёлы, лясоў, паляванняў, пазней — багіня месяца, пакравіцелька дзяцей і жанчын. Яе атрыбуты — лук і стрэлы, факел, алень. Рымляне атаясамлівалі А. з Дыянай.

Да арт. Артэміда. Артэміда Версальская. Скульпт. Леахар. Канец 4 ст. да н.э. Рымская копія.

Фарміраванне артэзіянскіх водаў у артэзіянскім басейне: 1 — гліністыя пароды; 2 — ваданосныя пяскі; 3 — вапнякі; *ф* — месца (крыніца, свідравіна) выхаду вады на паверхню.

вёл і палявання, багіня месяца, пазней — заступніца шлюбу і дзетанараджэння. Яе ўяўлялі прыгажуняй у доўгім адзенні з паўмесяцам на галаве, з факелам ці з лукам і стрэламі ў руках. Лічылі, што нарадзілася А. на в-ве Дэлас. Найб. вядомыя свяцілішчы А. на п-ве Атыка і ў г. Эфес. У Эфесе быў храм А., прылічаны грэкамі да аднаго з 7 дзівосаў свету (спалены ў 356 да н.э. Герастратам). У рым. міфалогіі вядома як Дыяна. Міф пра А. натхніў ант. скульптараў Праксіцеля, Леахара, грэч. вазапісцаў, пазней — Тыцыяна, П.П.Рубенса, Рэмбранта, пісьменнікаў Дж.Бакачыо, Г.Гейнэ і інш.

**АРТЭ́МІЯ** (Artemia salina), ракападобнае атрада шчэлепаногіх. Пашырана ў салёных азёрах і лужынах паўпустыняў, пустыняў і марскіх ліманаў, здольная жыць пры салёнасці вады ад 40 да 230‰ і болей.

Даўж. 0,8—1 см. У залежнасці ад салёнасці вады зменьваецца даўж. галінак вілачкі на канцы брушка (павялічваецца пры апрасненні). Жывіцца мікраскапічнымі водарасцямі і бактэрыямі. Размнажаецца 3 разы за сезон, плоднасць да 70 яец або наўплісаў. Разводзяць і выкарыстоўваюць на корм рыбам.

**АРТЭ́РЫІ** (грэч. artēria), крывяносныя сасуды, па якіх кроў рухаецца ад сэрца ва ўсе органы і часткі цела. Да А. належыць *аорта* і ўсе яе разгалінаванні, у т.л. самыя дробныя — артэрыёлы. А. нясуць кроў, багатую кіслародам (толькі лёгачныя накіроўваюць вянозную кроў ад сэрца ў лёгкія).

Сценкі А. маюць 3 абалонкі. Вонкавая злучальнатканкавая абалонка надае А. трываласць і эластычнасць, што дае магчымасць ім вытрымліваць унутраны ціск, расцягацца і звужацца; багатая сасудамі і нервамі. Сярэдняя абалонка складаецца з эластычных валокнаў і гладкіх мышачных клетак, скарачэнне або расслабленне якіх рэгулюе дыяметр прасвету А. і, адпаведна, колькасць крыві, што падаецца да органа. Унутраная абалонка ўтворана эндатэліем і злучальнай тканкай, мае ўнутраную эластычную мембрану, што робіць сценкі больш трывалымі. Асобныя ствалы адной або некалькіх суседніх А. часта злучаюцца паміж сабой і ўтвараюць *анастамозы* (больш дробныя А.). А., што не маюць анастамозаў, наз. канцавымі. *Ю.Г.Шанько.*

**АРТЭРЫІ́Т**, запаленне сценкі *артэрыі*. Па характары запаленчага працэсу адрозніваюць спецыфічныя і неспецыфічныя А., па яго лакалізацыі на сценцы артэрый — энда-, меза- і перыартэрыіты; пашкоджанне ўсёй сценкі — панартэрыіт. Можа быць самастойным захворваннем (калі пашкоджанне артэрый вядучае ў паталагічным працэсе, мае сістэмны, генералізаваны характар) і другасным (развіваецца на фоне інш. хвароб; паталагічны працэс у сасудах ізаляваны, пашкоджаны асобныя групы артэрый). Другасныя А. могуць быць пры дыфузных хваробах злучальнай тканкі, сепсісе, інфекц. эндакардыце, інш. інфекц. захворваннях, некаторых злаякасных пухлінах, ужыванні лекавых сродкаў. Ускладненні пры А.: *анеўрызмы* (пры язвава-некратычных працэсах у сценках артэрый), трамбозы і эмбаліі, склеразаванне і *аблітэрацыя* сасудаў. *М.Ф.Сарока.*



Артэмія: салёнаводная форма.

Аружэйная палата. 1848—51.

**АРТЭРЫЯ́ЛЬНЫ ЦІСК**, ціск крыві ўнутры аорты і буйных артэрый. Узнікае ад нагнятальнай дзейнасці сэрца, супраціўлення сасудаў і абумоўлены гідрастатычнымі сіламі. Найб. супраціўленне цёку крыві ў аорце і артэрыях. А.ц. у перыяд скарачэння (сісталы) жалудачкаў сэрца наз. сісталічным, у час расслаблення (дыясталы) — дыясталічным. Вымяраецца ў мм рт. сл. Макс. ўзроўню (верхні) дасягае ў перыяд скарачэння (сісталы), мінім. (ніжні) — у час расслаблення (дыясталы). Велічыня А.ц. залежыць ад віду жывёл, стану сэрца і сасудаў, колькасці крыві, узросту, індывід. асаблівасцяў арганізма і інш. У буйных артэрыях чалавека сісталічны ціск у норме складае 110—130, а дыясталічны — 60—80 мм рт. сл. З узростам А.ц. крыху павышаецца. Існуюць 2 метады вымярэння А.ц.: прамы (крывавы) і ўскосны (бяскроўны) з дапамогай спец. прыладаў.

**АРТЭФА́КТ** (ад лац. artefactum штучна зробленае), стараж. рэч, якая зроблена ці мае сляды карыстання чалавекам. Элемент *археалагічнай культуры*, частка матэрыяльнай культуры пэўнага этапу, бо адлюстроўвае гісторыю яе развіцця. Сярод А. вылучаюць культурнавызначальныя, этнавызначальныя («кіравальныя») і «датавальныя» рэчы, імпартныя, выпадковыя, запазычаныя і інш.

**АРУ́БА** (Aruba), уладанне Нідэрландаў на аднайм. востраве ў архіпелагу М. Антыльскіх а-воў у паўд. частцы Карыбскага м. Пл. 193 км², нас. 65 тыс. чал. (1993). Адм. ц. — г. *Араньестад*. У складзе насельніцтва пераважаюць негры і мулаты, жывуць таксама іспанцы, галандцы, кітайцы і інш. Афіц. мова нідэрландская, пашыраны мовы мясц. крэолаў (пап'амента), ісп. і англійская. Пануючая рэлігія — каталіцызм. Нац. свята — Дзень сцяга Арубы (18 сак.).

Вулканічны востраў выш. 188 м, акружаны рыфамі, рэльеф узгорысты. Клімат субэкватарыяльны, сярэднямесячныя т-ры 26—28 °С, ападкаў 500—600 м за год. Працуюць прадпрыемствы па ачыстцы нафты, вырабе цыгарэт, спіртных (ром) і безалкагольных напіткаў, суднаверф. Сельская гаспадарка развіта слаба з-за малой урадлівасці глебаў і недахопу прэснай вады. Вырошчваюць алоэ, якое выкарыстоўваюць у касметычных і фармацэўтычных вырабах. Нязначная жывёлагадоўля. Развіта рыбалоўства. Турызм. Асн. частка прадуктаў харчавання імпартуецца. Даўж. аўтадарог каля 380 км. Гал. порт — Араньестад, побач міжнар. аэрапорт. Гандлёвыя партнёры — Венесуэла, ЗША, Нідэрланды, Вялікабрытанія. Цесныя эканам. сувязі з федэрацыяй Нідэрландскіх Антыльскіх а-воў. Грашовая адзінка — арубскі гульдэн (фларын).

Задоўга да адкрыцця еўрапейцамі в-аў А. насялялі індзейцы, якія ўпрыгожылі пячоры малюнкамі, што па старажытнасці не саступаюць дагістарычным малюнкам у пячорах Альтаміры (Іспанія) і Ласко (Францыя). У 1499 Іспанія аб'явіла вастраў сваім уладаннем. У 1634 захоплены галандцамі. Да пач. 19 ст. востраў неаднаразова мяняў дзярж. прыналежнасць, з 1816 уладанне Нідэрландаў. Да 1863 быў буйным цэнтрам гандлю рабамі ў Вест-Індыі. Да 1986 А. ўваходзіла ў склад федэрацыі Нідэрландскіх Антыльскіх а-воў. З 1.1.1986 мае статус тэр. Нідэрландаў з унутр. самакіраваннем. Асн. паліт. партыі — Выбарчы рух народа і Народная партыя А.; Федэрацыя прафсаюзаў в-ва А. і інш.

**АРУВІ́МІ** (Aruwimi), рака ў Афрыцы, у Заіры, правы прыток р. Конга. Даўж. каля 1300 км, пл. бас. 116 тыс. км². Пачынаецца ў Сініх гарах пад назвай Ітуры (на З ад воз. Мабуту-Сесе-Сека), цячэ на плато, потым спускаецца ва ўпадзіну Конга. У верхнім і сярэднім цячэнні парогі і вадаспады. Паводкі (сак.—кастр.). Сярэдні расход вады 2 тыс. м³/с. Суднаходная на працягу 60 км ад вусця.

**АРУЖЭ́ЙНАЯ ПАЛА́ТА** ў Маскве, 1) дзярж. ўстанова на тэр. Маскоўскага Крамля ў будынку, пабудаваным у 1851 арх. К.А.Тонам. Упершыню ўпамінаецца ў 1547 як сховішча зброі, у 1640 пры ёй створана іканапісная, у 1683 — жывапісная майстэрні, уваходзіла палата разьбяных і сталярскіх спраў; у 1700 у А.п. ўліліся Залатая і Сярэбраная палаты. У ёй праводзіліся заняткі па маст. рамястве, іканапісе і жывапісе, працавалі жывапісцы І.А.Безмін, С.Ф.Ушакоў, І.Уладзіміраў, гравёр А.Ф.Зубаў і інш. У 2-й пал. 17 ст. сярод майстроў палаты былі выхадцы з Беларусі: Хрыстафор Абросімаў, Пётр *Абросімаў*, Восіп Андрэеў, Іван Андрэеў, *Арсеній*, Сцяпан Іванаў (*Палубес*), Фёдар Мікулаеў, Максім Сямёнаў, Восіп Якаўлеў і інш. Бел. майстры выраблялі кафлю, зброю, аздаблялі яе арнаментальнымі ўзорамі, працавалі па серабры, рабілі па-мастацку аформленыя сталы, шафы, троны, крэслы, вырэзвалі іканастасы, чаканілі рэльефы на раках, упрыгожвалі разьбой карэты і інш. Бел. майстры ўпершыню прынеслі ў Рус. дзяржаву ажурна-аб'ёмную т.зв. флемскую разьбу, узбагацілі тэхніку вырабу шматкаляровай паліванай кафлі, наладзілі выраб буйных маёлікавых арх. дэталяў, стваралі рэльефныя выявы, блізкія да рэальных памераў чалавека. Бел. майстры ўпрыгожвалі арх. помнікі Масквы, Каломенскага, Ізмайлава, Разані і інш. У 1711 жывапісная школа закрыта, а майстры пераведзены ў Пецярбург. У 1720 А.п. аб'яднана з інш. царскімі майстэрнямі Крамля, з 1726 стала сховішчам каштоўных прадметаў. 2) Старэйшы рас. музей, створаны ў 1806. З 1960 у складзе Дзярж. музея Маскоўскага Крамля ў б. патрыяршых палатах на вул. Разіна. У А.п. прадстаўлена дэкар.-прыкладное мастацтва Расіі, Візантыі, Зах. Еўропы і шэрагу краін Пярэдняй Азіі 5 — пач. 20 ст., захоўваюцца рэдкія калекцыі старадаўняй маст. зброі (13—18 ст.), калекцыі залатога і сярэбранага посуду, тканін і адзення (14—19 ст.), дары паслоў, рэчы царскага і княжацкага ўжытку, ювелірныя вырабы і інш.

*Літ.:* Писарская Л., Мартынова М. Оружейная палата. 6 изд. М., 1987.

**А́РУМ**, род кветкавых раслін, гл. *Ароннік*.

**АРУНА́**, у ведыйскай і індуісцкай міфалогіі бажаство світання. Уяўлялася ў выглядзе Сонца на Усходзе. Паводле эпасу «Махабхарата» яго маці Вініта разбівае ў нецярплівасці знесенае ёю яйка, у якім знаходзіўся напаўразвіты А. Ён праклінае маці за сваю выродлівасць і прадракае ёй рабства.

Арфа.

**А́РУНТА ПУСТЫ́НЯ** (Arunta), гл. *Сімпсана пустыня*.

**АРУ́РА** (Oruro), горад у Балівіі, у Андах. Адм. ц. дэпартамента Арура. Засн. ў пач. 17 ст. 184 тыс. ж. (1986). Трансп. вузел. Адзін з цэнтраў горназдабыўной (волава, вальфрам, медзь, сурма) прам-сці. Каляровая металургія. Харч., тэкст., абутковая прам-сці. Ун-т.

**АРУТЧА́Н** Міхаіл (Мікаэл) Аветавіч (29.7.1897, г. Шуша, Нагорны Карабах — 20.6.1961), армянскі тэатральны мастак і графік. Нар. мастак Арменіі (1958). Вучыўся ў Саратаве (1920—23), у Парыжы (у акадэміі Каларосі, 1924—25). Адзін з заснавальнікаў арм. тэатральна-дэкарацыйнага мастацтва. Аформіў больш як 100 спектакляў, у т.л. «Жаніцьба Фігара» П.А.Бамаршэ (1933), «Атэла» У.Шэкспіра (1940), «Пікавая дама» П.І.Чайкоўскага (1956) і інш.

**АРУЦЮНЯ́Н** Аляксандр Рыгоравіч (н. 23.9.1920, Ерэван), армянскі кампазітар. Нар. арт. СССР (1970). Скончыў Ерэванскую кансерваторыю (1941), з 1962 выкладае ў ёй (з 1977 праф.). З 1954 кіраўнік Армянскай філармоніі. Сярод твораў: опера «Саят-Нава» (1969); «Кантата аб Радзіме» (1948), «Паданне аб армянскім народзе» (1961); сімфонія (1957); 5 канцэртаў з аркестрам для розных інструментаў; камерна-інстр. і вак. творы (у т.л. для хору а капэла); музыка да драм. спектакляў і кінафільмаў. Дзярж. прэмія СССР 1949, Дзярж. прэмія Арменіі 1970, 1986.

*Літ.:* Еолян И. Александр Арутюнян. М., 1962.

**А́РФА** (ням. Harfe), струнна-шчыпковы музычны інструмент.

Мае выгляд высокага трохвугольніка, бакамі якога з'яўляюцца рэзанансная расшыраная ўнізе скрынка, калонка з рычагамі механізма перастройкі і дугападобная рама ўверсе з калкамі і дыскамі педальнага механізма. Унутры трохвугольніка вертыкальна нацягнуты 44—47 струнаў рознай даўжыні і настройкі (дыяпазон $C_1$—$g^4$). Асн. строй А. дыятанічны (Ces-dur). З дапамогай 7 педаляў (вынайдзены ў 1801 С.Эрарам) яна механічна перастройваецца ва ўсе танальнасці. Гучанне мяккае, пяшчотнае, камернае. А. — стараж. струнны інструмент, вядомы многім народам свету (найб. раннія выявы датуюцца 5-м тыс. да н.э.). З 17 ст. выкарыстоўваецца як аркестравы, з 18 ст. — як ансамблевы і сольны інструмент. На Беларусі А. і яе выявы сустракаюцца ў літ. помніках і размалёўках каталіцкіх храмаў 16—19 ст. У Бел. акадэміі музыкі існуе клас А. *І.Дз.Назіна.*

**АРФАГРАФІ́ЧНЫ СЛО́ЎНІК**, алфавітны даведнік, які падае правільнае напісанне рэестравых слоў і іх формаў у адпаведнасці з існуючымі правапіснымі нормамі. Яго лічаць «слоўнікам слоўнікаў», паколькі ўсе інш. даведнікі арыентуюцца на яго і толькі ў ім поруч з рэестравай лексікай падаецца ў сістэматызаваным выглядзе афіцыйна ўзаконены звод арфаграфічных правілаў. А.с. любой мовы падзяляюць на агульныя (напр., «Слоўнік беларускай мовы: Арфаграфія. Арфаэпія. Акцэнтуацыя. Словазмяненне», 1987) і аспектныя слоўнікі. Сярод аспектных вылучаюць: спецыяльныя (напр., рус. «Арфаграфічны марскі слоўнік» Р.Э.Парэцкай, 1974); школьныя (бел. «Арфаграфічны слоўнік: Для пачатковых класаў», 5-е выд., 1987; «Арфаграфічны слоўнік: Для сярэдняй школы» М.П.Лобана і М.Р.Судніка, 6-е выд., 1990); вузкааспектныя, якія засяроджваюць увагу на правільным напісанні слоў пэўных разрадаў (бел. «Асобна, разам, праз дэфіс» М.Р.Прыгодзіча, 1994; рус. «Вялікая ці малая?» Д.Э.Разенталя, 3-е выд., 1987, і інш.). *В.К.Шчэрбін.*

**АРФАГРА́ФІЯ** (ад грэч. orthos правільны + ...*графія*), правапіс, сістэма правілаў, якія вызначаюць адналькавыя спосабы перадачы маўлення на пісьме. Асн. задачы бел. А. — рэгламентацыя графічнага ўзнаўлення гукавога складу слова; злітнага, паўзлітнага (дэфіснага) і раздзельнага напісання; пераносу слоў, а таксама правілы афармлення абрэвіятур, умоўных скарачэнняў. У перадачы гукавога складу слова адрозніваюць 2 асн. прынцыпы: фанетычны (захаванне асаблівасцяў вымаўлення) і марфалагічны (захаванне нязменнымі асобных марфал. частак слова); сустракаюцца таксама правапісныя нормы, замацаваныя традыцыяй. Сучасная бел. А. рацыянальна спалучае фанет. і марфал. прынцыпы.

Бел. А. фарміравалася на працягу доўгага часу. Ужо ў ранніх помніках бел. пісьменства



Арфведсаніт.

14—15 ст. адлюстраваны найб. характэрныя асаблівасці бел. *фанетыкі*. З 19 ст., калі жывая нар. гаворка стала асновай бел. літ. мовы, складваюцца і замацоўваюцца найважнейшыя рысы бел. А. (напр., перавага аддаецца фанет. прынцыпу). Станаўленню арфаграфічных нормаў садзейнічала навук. распрацоўка бел. мовы на пач. 20 ст. (працы Я.Ф.Карскага). Першая спроба нармалізаваць А. зроблена ў «Граматыцы для беларускіх школ» Б.А.Тарашкевіча (1918). Пастановай СНК БССР ад 23.8.1933 «Аб зменах і спрашчэнні беларускага правапісу» праведзена ўдакладненне бел. А., значная роля была адведзена марфалаг. прынцыпу. Пасля шырокай дыскусіі ў 1929—57 СМ БССР зацвердзіў праект Арфаграфічнай камісіі «Аб удакладненні і часткових зменах існуючага беларускага правапісу» (11.5.1957). На яго аснове выдадзены «Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» (1959). Аднак і яны не ахопліваюць усіх спрэчных і няясных выпадкаў, таму праца па ўдасканаленні правілаў бел. А. працягваецца.

*Літ.:* Сучасная беларуская літаратурная мова: Лексікалогія. Фразеалогія. Лексікаграфія. Фразеаграфія. Фанетыка. Арфаэпія. Графіка. Арфаграфія. 2 выд. Мн., 1984; Беларуская мова: Цяжкія пытанні фанетыкі, арфаграфіі, граматыкі. Мн., 1987; Камароўскі Я.М. Сучасная беларуская арфаграфія. Мн., 1985. *П.П.Шуба.*

Арфей, які іграе на ліры. Мазаіка. 3 ст.

**АРФАЭ́ПІЯ** (ад грэч. orthos правільны + epos маўленне), сукупнасць вымаўленчых нормаў, уласцівых літаратурнай мове, якія забяспечваюць аднастайнасць гукавога афармлення вуснай мовы. 2) Раздзел *моўнаўства*, які вывучае нормы вымаўлення. Непарыўна звязана з фанетычнай сістэмай мовы, бо ўключае і характарыстыку вымаўлення асобных гукаў (арфафанію, напр. дзеканне, цеканне, неаглушэнне «й» і г.д.) і іх вымаўленне ў залежнасці ад пазіцыі ў слове. Такія, напр., выразныя асаблівасці бел. *фанетыкі*, як недысімілятыўнае *аканне* («вада», «маладзік», «чалавек»), прыстаўныя галосныя («ільняны», «аўторак», «імгла») і зычныя («вока», «завочнік»), мяккія свісцячыя «з» і «с» перад наступнымі мяккімі («бязлесіца», «з зімы», «песня»), мяккія афрыкаты «дз» і «ц» («Дзвіна», «дзверы», «цвёрды»), губна-губны «в(ў)» («траўка», «жоўты»), падоўжаныя зычныя («збожжа», «галлё», «насенне») замацаваліся як арфаэпічныя нормы. Да А. часта адносяць таксама правілы пастаноўкі націску і інтанацыйныя правілы.

*Літ.:* Янкоўскі Ф.М. Беларускае літаратурнае вымаўленне. 4 выд. Мн., 1976; Беларуская граматыка. Ч. 1. Мн., 1985; Фанетыка беларускай літаратурнай мовы. Мн., 1989.

**АРФВЕДСАНІ́Т** (ад прозвішча швед. хіміка Арфведсана), мінерал, манаклінны шчолачны *амфібол* $NaNa_2Fe^2{}_4+Fe^3+Si_8O_{22}(OH)_2$. Натрый можа замяшчацца кальцыем. Утварае прызматычныя крышталі, прамянёвашаставатыя агрэгаты, зерні. Колер цёмна-зялёны да чорнага. Паўпразрысты. Бляск шкляны. Цв. 5,5—6. Шчыльн. 3,4—3,5 г/см$^3$. Пародаўтваральны мінерал. Пашыраны ў масівах нефелінавых сіенітаў і іх пегматытах, некаторых шчолачных гранітах, метасаматытах і карбанатытах.

**АРФЕ́Й**, у грэчаскай міфалогіі фракійскі спявак, сын музы Каліопы. Цудоўнымі спевамі і ігрой на кіфары ён зачароўваў багоў і людзей, утаймоўваў дзікія сілы прыроды. Паводле міфаў, А. удзельнічаў у паходзе *арганаўтаў*, лічыўся заснавальнікам арфічных культаў. Калі раптоўна памерла яго жонка Эўрыдыка, А. адправіўся за ёю ў царства мёртвых. Міф пра А. — часты сюжэт у выяўл. мастацтве (ант. вазы, фрэскі, карціны П.Рубенса, Я.Тынтарэта), л-ры (Авідзій, Вергілій), музыцы (К.Глюк, Ф.Ліст, І.Стравінскі) і інш.

**АРХАЗА́ЎРЫ** (Archosauria), самы вялікі падклас выкапнёвых паўзуноў. 5 атр.: тэкадонты (зыходная група А.), *кракадзілы*, дыназаўры яшчара- і птушкатазавыя, птэразаўры (лятучыя яшчары). Знойдзены ў адкладах верхняй пярмі на ўсіх кантынентах. Насялялі сушу, прэсныя і марскія воды, паветра.

Даўж. да 35 м, маса да 50 т. Пярэднія канечнасці карацейшыя і слабейшыя за задніе. Чэрап з дзвюма скроневымі ўпадзінамі. У многіх скурны панцыр. Драпежнікі і расліна-

Да арт. Архазаўры: птушкатазавы дыназаўр ігуанадонт.

едныя. У сучаснай фауне прадстаўлены толькі кракадзіламі. Ад А. паходзяць птушкі.

**АРХА́ІЗМ** (ад грэч. archaios старадаўні, старажытны), устарэлая назва сучаснай рэаліі, што абазначаецца новым словам: напр., «раць» — войска, «рамёны» — плечы. Архаічнымі могуць быць і формы слоў. Адрозніваюцца А.: уласналексічныя («каморнік» — землямер), лексіка-семантычныя («жывот» — жыццё), лексіка-фанетычныя («кроніка» — хроніка), лексіка-акцэнталагічныя («рапо́рт» — ра́парт), лексіка-словаўтваральныя («лгар» — лгун), лексіка-марфалагічныя («паэта» — паэт). Выкарыстоўваюцца ў мове як стылістычны сродак. *І.Л.Бурак.*

**АРХА́ІКА** (ад грэч. archaïkos старадаўні, старажытны), ранні этап у гіст. развіцці якой-небудзь з'явы. У мастацтвазнаўстве тэрмін выкарыстоўваецца гал. чынам для вызначэння ранняга перыяду

развіцця архітэктуры і выяўл. мастацтва Старажытнай *Грэцыі* (7—6 ст. да н.э.), калі выпрацоўваліся найважнейшыя арх.-маст. прыёмы, традыцыйныя для грэч. *класікі*.

Архітэктура развівалася на аснове стоечна-бэлечнай канструкцыйнай сістэмы, выяўл. мастацтва — вобразаў ант. міфалогіі. Найважнейшымі дасягненнямі мастацтва перыяду А. была выпрацоўка прапарцыянальных канонаў і дэкар. формаў арх. *ордэра* (у т.л. дарычнага і іанічнага), асн. тыпажу манум. скульптуры, чорна- і чырвонафігурнага стыляў *вазапісу*; з'явіліся і новыя тыпы манум. скульптуры — статуі юнакоў-атлетаў (курас) і дзяўчат (кора). У больш шырокім значэнні А. — мастацтва стараж. гіст. эпох, якое вызначаецца прымітывізмам формаў. У мастацтвазнаўстве тэрмін «А.» выкарыстоўваецца ў дачыненні да твораў, у якіх ёсць рэтраспектыўныя формы старажытнасці (пераважна антычнасці).

На Беларусі зварот да формаў А. найб. выявіўся ў познім класіцызме ў інтэр'еры палацаў (*Жыліцкі палацава-паркавы ансамбль*) і пры трактоўцы малых арх. формаў у палацава-паркавым мастацтве (сфінксы на варотах Новага замка ў Гродне, фантан *Нараўлянскага сядзібна-паркавага ансамбля* і мемарыяльнай архітэктуры (капліца-пахавальня сядзібы ў в. Маліноўшчына Маладзечанскага р-на). *А.М.Кулагін.*

**АРХАЛА́КСІС** (ад грэч. archē пачатак + allaxis змена), адзін са спосабаў эвалюцыі, пры якім змена першапачатковай закладкі органа адбываецца на ранняй стадыі *эмбрыягенезу* і мяняе ўвесь далейшы ход яго развіцця. Тэрмін увёў рус. вучоны А.М.Северцаў (1910) у сваёй тэорыі *філэмбрыягенезу*. Пры А. адбываецца адносна буйная скачкападобная змена будовы органаў і ўзнікаюць новыя органы, якіх не было ў продкаў. Па тыпе А., напр., развіваецца закладка валасоў у зародкаў млекакормячых (інакш, чым плакоідная луска ў рыб або рагавая ў паўзуноў).

**АРХА́НГЕЛЫ** (грэч. archangelos), паводле хрысціянскіх вераванняў — старшыя *анёлы*. Артадаксальная хрысц. традыцыя называе 3 А.: Міхаіла — нябеснага архістратыга (военачальніка), анёла-апекуна ўсіх хрысціян; Гаўрыіла — божага пасланніка, які прынёс добрую вестку Марыі (гл. *Благавешчанне*); Рафаіла — анёла-лекара.

**АРХА́НГЕЛЬСК**, горад у Расіі, цэнтр Архангельскай вобл., у вусці р. Паўн. Дзвіна. 415,7 тыс. ж. (1994). Марскі і рачны порт. Чыг. вузел. Аэрапорт. Буйны цэнтр лесаапр., лесахім. (цэлюлозна-папяровая, гідролізная) прам-сці. Машынабудаванне (абсталяванне для лясной і дрэваапр. прам-сці, суднабудаванне і суднарамонт), харч. (мяса-малочная, перапрацоўка марскіх водарасцяў) прам-сць; выт-сць буд. матэрыялаў. Мастацкія промыслы (разьба па дрэве і косці). Пачатковы пункт многіх палярных экспедыцый, адна з асн. баз Паўн. марскога шляху.

Засн. ў 1584 паводле загаду Івана IV. Наз. Новахалмагоры, з 1613 Архангельскі (ад назвы Міхайла-Архангельскага манастыра), пасля — Архангельск. Першы марскі порт Расіі. У 1693 Пётр I заклаў на в-ве Саламбал верф і засн. адміралцейства. У 1701—05 у Карабельным вусці пабудавана Навадзвінская крэпасць. З 1708 цэнтр Архангелагародскай губ. У 1771 засн. мараходнае вучылішча. З канца 19 ст. буйны лесапрамысл. і лесаэкспартны пункт Расіі. З 1898 звязаны чыгункай з Масквой. З 1929 цэнтр Паўн. краю, з 1936 — Паўночнай, з 1937 — Архангельскай вобл. У царскія і сав. часы месца паліт. ссылкі.

**АРХА́НГЕЛЬСКАЕ**, сядзібны ансамбль 18—19 ст. за 20 км ад Масквы, з 1918 музей-сядзіба. З 1703 належала князям Галіцыным, у 1810—1917 — князям Юсупавым. Пабудавана ў стылі класіцызму. На тэр. А. палац (1780-я г., арх. дэ Гёрн, перабудаваны ў 1811—28), у якім захаваліся аддзелка, мэбля, кераміка і інш. вырабы прыгонных майстроў, а таксама карціны (А.Ван Дэйка, Дж.Б.Цьепала, Ф.Бушэ, П.Ратары) і скульптура (Э.М.Фальканэ, І.П.Віталі),

Да арт. Архаіка. Фрагмент вазапісу. Майстар Эксекій. 6 ст. да н.э.

Да арт. Архаіка. Капліца-пахавальня ў в. Маліноўшчына Маладзечанскага раёна Мінскай вобл. 2-я пал. 19 ст.

парк (18 ст.) з тэрасамі, шматлікімі бюстамі, статуямі і паркавымі збудаваннямі (у т.л. тэатр., 1817—18, з дэкарацыямі П.Ганзага).

**АРХА́НГЕЛЬСКАЯ ВО́БЛАСЦЬ**, у складзе Расіі. Утворана 23.9.1937. Пл. 587,4 тыс. км². Насельніцтва 1547,4 тыс. чал. (1994), гар. 76%. Цэнтр — г. *Архангельск*. Уключае *Ненецкую аўтаномную акругу* і астравы Паўн. Ледавітага ак. (Калгуеў, Вайгач, Новая Зямля, Зямля Франца-Іосіфа, Салавецкія і інш.). Найб. гарады: Котлас, Северадзвінск, Навадзвінск, Анега.

**Прырода.** Размешчана на Пн Усх.-Еўрапейскай раўніны. У паўн.-зах. частцы тэр. цягнецца горны краж Ветраны Пояс (выш. да 344 м), на ПнУ — Ціманскі краж (выш. да 303 м), Канін Камень (да 242 м) і хр. Пай-Хой (выш. да 467 м). Цэнтральная ч. пераэана далінамі рэк, асобныя платопадобныя ўчасткі выш. 150—270 м (Каношскае і Няндомскае ўзвышшы, Беламорска-Кулойскае плато і інш.). На У ад Ціманскага кража — вялізная забалочаная Пячорская нізіна б.ч. якой занята

Архангельскае. Палац. Паўночны фасад.

Вяліказямельскай і Малазямельскай тундрамі з шэрагам марэнных градаў выш. да 250—275 м. Карысныя выкапні: медзь, баксіты, алмазы, свінцова-цынкавыя руды, вапнякі, даламіты, гліны, кварцавыя пяскі, нафта, прыродны газ, вял. запасы торфу. Клімат на Пн субарктычны, на Пд умерана кантынентальны. Сярэднія т-ры студз. ад -12 да -18 °С, ліп. ад 8 да 16 °С. Ападкаў 300—500 мм за год. На Пн шматгадовая мерзлата. Гал. рэкі: Паўн. Дзвіна (з прытокамі Вычэгда, Пінега і Вага), Пячора, Анега, Мязень. Густая сетка азёраў (каля 2,5 тыс.), найб. Лана, Кенвозера, Кожвозера. Рэзка выяўлена шыротная занальнасць глебава-раслінная покрыва. На ПнУ зона тундры (арктычная, мохава-лішайнікавая і хмызняковая) на тундрава-глеевых і тундрава-балотных глебах. Зона лесатундры занята рэдкалессем на тарфяна-глеевых і слабападзолістых глебах. Лясы займаюць 1/2 тэр. А.В., пераважае тайга з елкі і хвоі, на У трапляюцца піхта і лістоўніца. У А.в. Пінежскі запаведнік.

**Гаспадарка.** А.в. — буйны раён лесанарыхтоўкі, лесапілавання, лесаэкспарту, цэлюлозна-папяровай вытв-сці. Развіты машынабудаванне (суднабудаванне, суднарамонт, дарожныя машыны, абсталяванне для лясной прам-сці), лёгкая, харч. прам-сць. Вытв-сць буд. ма-

тэрыялаў. Гал. галіны сельскай гаспадаркі — малочная жывёлагадоўля (высокапрадукцыйная халмагорская буйн. раг. жывёла). На Пн — аленегадоўля, зверагадоўля, пушны і марскі промысел. Пасевы жыта, бульбы, агародніны. Марскі і рачны транспарт (водная трансп. сістэма — Паўн. Дзвіна з прытокамі), суднаходныя таксама Вычагда, Пячора, Мязень. Парты: Архангельск, Анега, Мязень, Нар'ян-Мар. Чыг. лініі Волагда-Архангельск, Канаш—Котлас—Мікуль. Касмадром Плясецк. Цэнтры нар. промыслаў: Каргапаль, Сольвычагодск, Халмагоры. Курорты: Сольвычагодск, Саланіха, Беламор'е і інш. На Салавецкіх а-вах гіст.-арх. і прыродны музей-запаведнік з *Салавецкім манастыром.* *П.І.Рогач.*

**АРХА́НГЕЛЬСКІ** Аляксандр Андрэевіч (23.10.1846, с. Старое Тэзікава Пензенскай вобл. — 16.11.1924), рускі харавы дырыжор. Засл. арт. Рэспублікі (1921). Працаваў рэгентам хароў у Пензе і Пецярбургу. Упершыню ўвёў у царк. спевы жаночыя галасы (замест галасоў хлопчыкаў). У 1880 арганізаваў мяшаны хор, з якім канцэртаваў па Расіі. Аўтар хар. твораў, у т.л. духоўных, апрацовак нар. песень. Выдаў серыю «Рэпертуар канцэртаў А.А.Архангельскага» (1893—94).

**АРХА́НГЕЛЬСКІ** Андрэй Дзмітрыевіч (8.12.1879, г. Разань — 16.6.1940), рускі геолаг. Акад. АН СССР (1929, чл.-кар. 1925). Праф. (1918). Скончыў Маскоўскі ун-т (1904). Выкладаў у Маскоўскім ун-це, Горнай акадэміі, Межавым і Геолагаразведачным ін-тах. Даследчык геал. будовы Еўрап. часткі СССР, Казахстана, Сярэдняй Азіі і інш. Кіраваў вывучэннем Курскай магнітнай анамаліі. Навук. працы па рэгіянальнай геалогіі, стратыграфіі, тэктоніцы, петраграфіі асадкавых пародаў, палеагеаграфіі і інш. Прэмія імя У.І.Леніна (1928).

*Тв.:* Избр. труды. Т. 1—2. М., 1952—54.

*Літ.:* Гордеев Д.И. А.Д.Архангельский, 1879—1940. М., 1981.

**АРХА́НГЕЛЬСКІ ЦЭЛЮЛО́ЗНА-ПАПЯРО́ВЫ КАМБІНА́Т**, у г. Навадзвінск Архангельскай вобл. Расійскай Федэрацыі, адзін з найбольшых у Еўропе. Першая чарга (сульфіт-цэлюлозны з-д і папяровая ф-ка) пачала дзейнічаць у 1940, другая (сульфат-цэлюлозны з-д і кардонная ф-ка) — у 1972, трэцяя (з-д беленай сульфатнай цэлюлозы) — у 1975. З 1994 холдынг. Асн. прадукцыя (1995): цэлюлоза, тарны кардон, папера. Выпускае таксама этылавы спірт, кармавыя дрожджы, драўняна-валакністыя пліты, сшыткі, папярова-белавыя тавары. Занята больш за 10 тыс. працаўнікоў (1990). Магутнасці разлічаны на перапрацоўку 4,5 млн. м³ драўніны за год. Частка прадукцыі экспартуецца ў Беларусь.

*Я.М.Селіцкая.*

**АРХА́НТРАПЫ** (ад грэч. archaios старажытны + anthrōpos чалавек), адна са стадый эвалюцыі чалавека; выкапнёвыя людзі, якія ў раннім плейстацэне прыйшлі на змену чалавеку ўмеламу (Homo habilis). Усіх А. аб'ядноўваюць у адзін від — чалавек прамахадзячы (Homo erectus). Шматлікія знаходкі яго рэштак даюць магчымасць датаваць перыяд існавання гэтага віду тэрмінам ад 1,6 млн. да 360 тыс. гадоў назад, калі А. былі адзінымі прадстаўнікамі роду чалавечага, якія ў часе адносна мала мяняліся. У параўнанні са сваім папярэднікам (чалавекам умелым) А. характарызуюцца павелічэннем памераў цела, буйным абліччам і зубамі. Ад сучасных людзей адрозніваліся больш прымітыўнай будовай чэрапа (нізкае скляпенне са сплюшчваннем патылічнага аддзела, выступанне сківіц), адсутнасцю падбародачнага выступу ніжняй сківіцы, моцна развітымі надброўямі. Найб. стараж. касцявыя рэшткі (1,6 млн. гадоў) А. знойдзены ў Афрыцы (Кенія). Шматлікія, але менш старажытныя (ад 900 да 500—400 тыс. гадоў назад) рэшткі А. выяўлены на Б. Усходзе і ў Кітаі (*сінантрапы*), на в-ве Ява (яванскі пітэкантрап, маджакерскі чалавек; гл. *Пітэкантрапы*), на тэр. Еўропы стаянкі А. у Германіі (*гейдэльбергскі чалавек*), Венгрыі (паселішча Верцешсёлёш), Чэхіі (Пржэзліцэ), Грэцыі (Петралона) і інш. Больш за 100 стаянак А. без касцявых рэштак адкрыта на тэр. Сярэдняй Азіі, Каўказа, Прыазоўя, Закарпацця, Алтая, Малдовы і інш. Па меры асваення новых жыццёвых арэалаў у выніку прыстасавання да новых умоў асяроддзя адбываліся змены морфатыпаў А. (узнікненне расавых адрозненняў). А. выраблялі каменныя прылады ашэльскага тыпу. Далейшая эвалюцыя А. прывяла да ўзнікнен-

ня *палеантрапаў* і чалавека разумнага (Homo sapiens). *Л.І.Цягака.*

**АРХА́Р**, горны баран, аргалі, аркар, качкар (Ovis ammon), млекакормячая жывёла роду горных бараноў атр. парнакапытных. Каля 25 падвідаў. Пашыраны на а-вах Міжземнага м., у Пярэдняй, Сярэдняй, Цэнтр., Паўн.-Усх. і часткова Паўн. Азіі. Жыве статкамі на спадзістых схілах і высокіх горных плато.

Даўж. цела 1,1—2 м, выш. ў карку 0,65—1,25 м, маса ад 25 да 230 кг. Рогі масіўныя, выгнутыя, даўж. да 1,9 м, масай да 30 кг. Корміцца травой. Ягняты (1—2) нараджаюцца вясной. Каштоўная прамысл. жывёла, здабываецца дзеля мяса і скуры. Выкарыстоўваецца для гібрыдызацыі са свойскімі пародамі авечак (выведзены танкарунныя пароды — горны мерынос і архарамерынос). Ахоўваецца.

**АРХА́РАЎЦЫ**, 1) мянушка рас. паліцэйскіх, ад прозвішча маскоўскага обер-паліцмайстра М.П.Архарава (1742—1814). 2) У пераносным сэнсе — адчайныя, вёрткія, валацугі, буяны.

**АРХА́Т**, у будыйскай міфалогіі хінаяны чалавек, які дасягнуў найвышэйшага ўзроўню духоўнага развіцця, т.зв. нірваны. У міфалогіі махаяны стан А. лічыцца не канчатковай мяжой у развіцці асобы, і таму А. павінны працягваць шлях удасканалення як бадхісатвы (той, хто вырашыў стаць будай).

**АРХЕ́ АФІ́НСКАЯ**, афінская марская дзяржава, саюз старажытнагрэчаскіх палісаў, гл. *Дэлоскі саюз.*

**АРХЕА...** (ад грэч. archaios старажытны, старадаўні), першая састаўная частка складаных слоў, якая па значэнні адпавядае слову «старажытны», «які адносіцца да старажытнасці», напр., *археалогія, археаптэрыкс.*

**АРХЕАГРАФІ́ЧНАЯ КАМІ́СІЯ**, навуковая ўстанова, створаная ў 1834 у Пецярбургу пры Мін-ве нар. асветы для выдання матэрыялаў *археаграфічных экспедыцый.* Створана як часовая, з 1837 пастаянная ўстанова для збору, апісання і выдання гіст. дакументаў. Выдавала зборнікі дакументаў па гісторыі Расіі, Беларусі, Літвы, Украіны, Каўказа 14—18 ст., у т.л. Поўны збор рускіх летапісаў, Акты гістарычныя, Акты Заходняй Расіі, Акты Паўднёвай і Заходняй Расіі. З 1872 выходіла «Руская гістарычная бібліятэка», у 1862—1929 — «Летапіс заняткаў Археаграфічнай камісіі». У рабоце А.к. ўдзельнічалі І.С.Анацэвіч, І.І.Грыгаровіч, М.І.Кастамараў, П.М.Строеў, М.І.Сямёўскі, А.А.Шахматаў і інш. З 1922 А.к. ў складзе Акадэміі навук, у 1926 аб'яднана з Пастаяннай гіст. камісіяй АН СССР у Пастаянную гіст.-археаграфічную камісію, якая ў 1931 рэарганізавана ў Гіст.-археаграфічны ін-т. У 1956 пры аддзяленні гіст. навук АН СССР створана А.к., якая каардынавала археаграфічную дзейнасць ва ўстановах АН, выдавала «Археографический ежегодник». У 1864—1915 існавала *Віленская археаграфічная камісія.*

**АРХЕАГРАФІ́ЧНАЯ ЭКСПЕДЫ́ЦЫЯ**, экспедыцыя, якая накіроўваецца для выяўлення і збору гіст. крыніц. Адну з першых экспедыцый у 1809 арганізавала Рас. АН у гарады паўн. Расіі і на Украіну. У час экспедыцый 1817—18 (М.П.Румянцаў) і 1820 (П.М.Строеў) абследаваны архівы Масквы, б-кі манастыроў Маскоўскай, Наўгародскай і Разанскай губ. (выяўлены Ізборнік Святаслава 1073, Судзебнік 1497 і інш.). У 1829—34 А.э. на чале са Строевым даследавала каля 200 архіваў і б-к Паўн. Расіі, сабрала каля 3 тыс. актаў, летапісаў і інш. дакументаў 14—17 ст. (многія з іх выдала *Археаграфічная камісія*). Шэраг крыніц, у т.л. 14 ст., выявіла ў 1852—54 А.э. М.В.Калачова, якая працавала ў Цэнтр. Расіі. На Беларусі ў 19 — пач. 20 ст. экспедыцыі арганізоўвалі Віленскія археал. і археаграфічная камісіі, навуч. акруга. Іх праводзілі М.К.Баброўскі, І.І.Грыгаровіч, А.І.Мілавідаў і інш. Матэрыялы, сабраныя на Беларусі, захоўваюцца таксама ў рас. б-ках (АН, Маскоўскага ун-та і інш.). У 1970—80-я г. гіст. крыніцы збіралі Нац. б-ка Беларусі, Цэнтр. навук. б-ка імя Я.Коласа АН Беларусі, Рэсп. музей гісторыі рэлігіі, Веткаўскі музей нар. творчасці і інш.

Архар.

**АРХЕАГРАФІ́ЧНЫ ЗБО́РНІК ДАКУМЕ́НТАЎ** («Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси, издаваемый при Управлении Виленского учебного округа»), серыйнае выданне дакументаў па гісторыі Беларусі і Літвы 15—19 ст. Выйшла 14 т. (Вільня, 1867—1904). Матэрыялы выяўлены ў архівах, бібліятэках, манастырскіх і прыватных зборах. Асн. групы дакументаў зборніка: сац.-эканам. (інвентары, прывілеі, фундушы, цэхавыя статуты, судовыя справы), матэрыялы, у якіх асвятляюцца паліт. і культ. адносіны, войны (дыпламатычная перапіска, пасольскія дыярыушы), гісторыя правасл. царквы, брацтваў, манастыроў. Складальнікі зборніка імкнуліся даказаць прыналежнасць бел. і ўкр. народаў да адзінай рускай народнасці.

*Г.Я.Галенчанка.*

**АРХЕАГРА́ФІЯ** (ад *археа...* + *...графія*), навука, якая распрацоўвае тэорыю і методыку публікацыі дакументаў; у больш шырокім сэнсе — навук. дысцыпліна, якая займаецца пытаннямі, звязанымі з увядзеннем у навук. ўжытак пісьмовых крыніц на стадыі іх пошуку і збору (палявая А.), уліку і апісання (камеральная А.), публікацыі (эдыцыйная, або выдавецкая, А.). Цесна звязана з *крыніцазнаўствам, палеаграфіяй, дыпламатыкай, архівазнаўствам* і інш.

У Еўропе ўзнікла ў 16 ст. (крытычнае выданне «Жалобнай кнігі аб пагібелі Брытаніі» храніста 6 ст. Гільдаса, «Вялікіх французскіх хронік» і інш. у Францыі). У Германіі ў сярэдзіне 16 ст. Мацей Власіч падрыхтаваў класічную працу па царк. гісторыі — «Магдэбургскія цэнтуры». У 17 ст. *маўрысты* далі пачатак дыпламатыцы, палеаграфіі, выданню крыніц па гісторыі царквы сярэдневяковай Францыі. З 1630 разгарнулася археагр. дзейнасць *баландыстаў.* У 1819 у Германіі створана Т-ва па вывучэнні ранняй ням. гісторыі, якое заснавала серыйнае выданне «Monumenta germaniae historica». Распачаты серыйныя выданні ў Францыі, Італіі, Англіі, Венгрыі і інш. У Польшчы А. пачалася публікацыяй Пісторыюса «Polonicae historiae corpus» (Базель, 1582. Т. 1—3). А. займаліся бібліятэкі Дзялынскіх, ардынацыя Красінскіх, заклад Асалінскіх, Кракаўская АМ і інш. У Расіі арганізаваныя пошукі і публікацыі крыніц вядуцца з 18 ст. М.Навікоў распрацаваў правілы публікацыі дакументаў. Расійская АН у 1760-я г. выдала Радзівілаўскі летапіс (І.Баркоў) і 1-ю частку Ніканаўскага, «Русскую правду» (1767). У 19 ст. створаны Т-ва гісторыі і старажытнасцяў Расійскіх пры Маскоўскім ун-це (1804), Камісія друкавання дзярж. грамат і дагавораў (1811), Археагр. экспедыцыя АН (1829—34), Археагр. камісія (1834), Рускае гіст. таварыства. Значны ўклад у абагульненне вопыту выдання дакументаў зрабіў А.С.*Лапа-Данілеўскі.* У СССР А. займаліся гісторыка-археагр. камісія (пазней Гіст.-археагр. ін-т, які ў 1936 уліўся ў Ін-т гісторыі АН СССР), археагр. камісія пры Аддзяленні гіст. навук АН СССР. Значная работа вялася ў рэспубліках. Ажыўленне археагр. дзейнасці ў 20 ст. ў краінах Еўропы і ЗША звязана з удасканаленнем публікацыйнай тэхнікі. Высокім тэхн. узроўнем вызначаюцца серыйныя выданні «Класікі гісторыі сярэдневяковай Францыі» («Les classiques de l'histoire de France en moyen age», з 1923), «Збор арыгінальных крыніц па старажытнай гісторыі Германіі» («Corpus der altdeutschen Originalurkunden», з 1929), «Сярэдневяковыя класікі» («Medieval Classics», з 1950) у Англіі і інш. Гіст. крыніцы публікуюць гіст. т-вы,

нац. архівы, АН, мін-вы замежных спраў, ун-ты і інш. ўстановы розных краін.

На Беларусі камеральная А. пачалася са складання вопісаў манастырскіх бібліятэк і архіваў (Слуцкага Троіцкага ў 1494, Пінскага Ляшчынскага ў 1588, Супрасльскага, Жыровіцкага і інш.). Яна ўдасканальвалася пры вопісах у 16—19 ст. дакументаў Метрыкі Вялікага княства Літоўскага, інш. дзярж., царкоўных і прыватных архіваў. Выданне зб-ка «Suada Latina» («Пераканальная лаціна, альбо Збор рыторыкі, лістоў, статыстыкі, палітыкі, надпісаў, панегірыкаў, паэтыкі і гісторыі»), складзенага сакратаром пінскага дыстрыкта ордэна марыянаў Я.Д.Астроўскім (т. 1—2, Люблін, 1745—47), стала пачаткам эдыцыйнай А. У 19—20 ст. выдаваліся шматтомныя зб-кі дакументаў: *Акты Заходняй Расіі, Археаграфічны зборнік дакументаў, Акты Віленскай камісіі, «Гісторыка-юрыдычныя матэрыялы»*; асобныя выданні гіст. крыніц. Бел. летапісы выдаваліся ў *Поўным зборы рускіх летапісаў* і асобна. Са стварэннем Ін-та бел. культуры бел. А. стала на шлях самаст. развіцця. Арганізаваная ў 1925 Археагр. камісія Інбелкульта (старшыня М.Доўнар-Запольскі) падрыхтавала да выдання *«Беларускі архіў»*. Археагр. работу праводзяць К-т па архівах і справаводстве, ін-ты гісторыі і л-ры АН Беларусі, Беларуская Энцыклапедыя і інш. *М.В.Нікалаеў* (археаграфія Беларусі)

Экспазіцыя археалагічнага музея «Бярэсце».

Да арт. Археалагічныя помнікі. Умацаванае паселішча бронзавага веку Дун Энгус. Астравы Аран, графства Голуэй, Ірландыя.

Да арт. Археалагічныя помнікі. Гарадзішча Індура ў Гродзенскім р-не.

**АРХЕАЛАГІ́ЧНАЕ ДАТАВА́ННЕ**, устанаўленне ўзросту *археалагічнага помніка*. Выкарыстоўваюць 2 сістэмы А.д. — адносную і абсалютную храналогію. Пры адноснай храналогіі вызначаецца, якая з 2 рэчаў, культур або які з 2 культурных гарызонтаў, пластоў больш старажытны. Стратыграфічныя назіранні за шэрагам помнікаў даюць магчымасць стварыць храналагічную шкалу для старажытнасцяў — вызначыць парадак іх змянення з цягам часу. Абсалютная храналогія — устанаўленне ўзросту помніка ў звычайных вымярэннях нашага летазлічэння. Яна магчымая пры наяўнасці рэчаў з надпісамі, датамі, прозвішчамі асоб, упамінаннем вядомых гіст. падзей і інш. Датаванне помнікаў дапісьмовых эпох праводзіцца з дапамогай метадаў прыродазнаўчых навук. Археалагічны помнік можа датавацца: па геал. пласце; па гадавых пластах драўніны, знойдзенай на помніку (дэндрахраналагічны метад); па ступені назапашвання фтору або знікнення бялку-калагену ў выкапнёвых касцях старож. жывёл. Шырока выкарыстоўваюць радыевугляродны, палеа- і геамагнітны, тэрмалюмінесцэнтны і інш. аналізы.

**АРХЕАЛАГІ́ЧНАЯ КУЛЬТУ́РА**, гіст. агульнасць *археалагічных помнікаў*, што існавалі на акрэсленай тэрыторыі, прыкладна ў адзін час, аднастайныя па сваёй матэрыяльнай культуры, але істотна адрозніваюцца ад адначасовых помнікаў суседніх абласцей. А.к. — аб'ектыўна існуючая рэальнасць, якая адлюстроўвае ў рэштках матэрыяльнай культуры генезіс развіцця і гіст. лёс этнасу, якому яна належала. Звычайна А.к. даюць назву па найб. характэрнай прыкмеце (*штрыхаванай керамікі культура, шарападобных амфар культура*), абрадзе пахавання (*адзінкавых пахаванняў культуры*), ад найб. значнага ці найб. даследаванага помніка (*банцараўская культура, калочынская культура, мілаградская культура*) або мясцовасці, дзе пашыраны старажытнасці гэтай культуры (*верхнедняпроўская культура, нёманская культура* і інш.). Адрозненні А.к. павінны існаваць у такіх памерах і разнастайнасцях, якія немагчыма растлумачыць ні падабенствам умоў існавання, экалогіі і гасп.-культурнага тыпу, ні аднолькавым узроўнем грамадска-эканам. развіцця. У раннім жалезным веку адпаведнасць А.к. пэўнаму этнасу парушаецца. Пад уплывам прыродных працэсаў і чалавечай дзейнасці яна можа ўзбагачацца або збядняцца. Разам з тым А.к. — навук. паняцце, з дапамогай якога даследуецца гіст. працэс.

*Літ.:* Клейн Л.С. Археологическая типология. Л., 1991; Загорульский Э.М. Археология Белоруссии. Мн., 1965; Археалогія і нумізматыка Беларусі: Энцыкл. Мн., 1993.

*У.Ф.Ісаенка.*

**АРХЕАЛАГІ́ЧНАЯ РАЗВЕ́ДКА**, від і метад навукова-даследчай дзейнасці па вывучэнні *археалагічных помнікаў* на

аснове выяўленых знаходак. Праводзіцца паводле дазволу (адкрытага ліста). Пры А.р. на Беларусі асаблівая ўвага звяртаецца на абследаванне берагоў старыц і тарфяных масіваў, якія ў мінулым былі вадаёмамі. Асаблівы плён дае абследаванне зямель, якія разворваюцца, дзе лёгка прасочваюцца стараж. могільнікі і жытлы. Выкарыстоўваюць таксама авіяразведку, якая дае магчымасць выявіць малапрыкметныя з зямлі помнікі, з дапамогай электрапошуку атрымліваюць даныя пра рэшткі стараж. збудаванняў пад зямлёй. Знойдзеныя археал. помнікі наносяць на карту, апісваюць, робяць чарцяжы, фотаздымкі. Па сабраных знаходках вызначаюць папярэдняе датаванне помніка, яго прыналежнасць да пэўнай *археалагічнай культуры*.

**АРХЕАЛАГІ́ЧНЫ МУЗЕ́Й «БЯРЭ́СЦЕ»**. Заснаваны ў 1972, адкрыты 2.3.1982 на тэр. Валынскага ўмацавання *Брэсцкай крэпасці* як філіял *Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея* ў спецыяльна пабудаваным будынку. 14 экспазіцыйных залаў, пл. экспазіцыі 2400 м², больш за 40 тыс. экспанатаў (1995). Знаёміць з паліт., эканам. і культ. развіццём Бярэсця ў 11—14 ст. Аснову экспазіцыі складаюць больш за 30 драўляных жылых і гасп. пабудоў, рэшткі маставых, частаколы і інш. збудаванні, выяўленыя ў выніку археал. раскопак Берасцейскага гарадзішча, якія дзякуючы кансервавальным якасцям магутнага культ. пласта добра захаваліся на выш. да 12 вянкоў. Сярод экспанатаў прылады працы, прадметы побыту, упрыгожанні, а таксама рэдкія знаходкі — самшытавы грэбень з выразанымі кірылічнымі літарамі, касцяныя мастыхін, пісала, шахматная фігурка і інш.

**АРХЕАЛАГІ́ЧНЫЯ ПО́МНІКІ**, стараж. прадметы, збудаванні, пахаванні, што захаваліся на зямной паверхні, пад зямлёй або пад вадой і з'яўляюцца аб'ектам археал. даследаванняў. Да А.п. адносяцца: выкапнёвыя прылады працы, зброя, упрыгожанні, паселішчы (стаянкі, селішчы, гарадзішчы), рэшткі жытлаў, гідратэхн. збудаванняў, майстэрні, горныя выпрацоўкі, пячоры, стараж. ўмацаваныя лініі (абарончыя валы, равы), дарогі, пабудовы на палях, малюнкі і надпісы, высечаныя на асобных камянях і скалах, стараж. арх. помнікі, пахаванні, надмагільныя і культавыя збудаванні (каменныя бабы, следавікі, ідалы, свяцілішчы і інш.). А.п. — рэчавыя гіст. крыніцы, па якіх можна аднавіць мінулае чалавечага грамадства. На Беларусі выяўлена каля 900 стаянак каменнага і бронзавага вякоў, каля 1500 гарадзішчаў і селішчаў ранняга жал. веку і інш.

**АРХЕАЛАГІ́ЧНЫЯ РАСКО́ПКІ**, даследаванне *археалагічных помнікаў* пры дапамозе раскопвання культурнага пласта ў адпаведнасці з прынятай методыкай; раздзел палявой археалогіі. Праводзяцца толькі з дазволу адпаведных дзярж. устаноў спецыялістамі-археолагамі дзеля далейшага даследавання і гіст. вывадаў. Ажыццяўляюцца пасля *археалагічнай разведкі*. Культурны пласт помнікаў выбіраецца гарыз. пластамі таўшчынёй ад 5 да 20 см і перабіраецца рукамі (або прамываецца вадой), каб выявіць усе, нават дробныя рэчы. Пасля даследаванняў раскоп закопваецца, участак рэкультывуецца, некат. тыпы помнікаў (гарадзішчы, курганы) звычайна ўзнаўляюцца.

**АРХЕАЛО́ГІЯ** (ад *археа...* + *...логія*), галіна гістарычнай навукі, якая вывучае

Да арт. **Археалагічныя помнікі**. Курганы каля в. Высачаны Лёзненскага р-на Віцебскай вобл..



**Археалагічныя раскопкі** Віцебскага Верхняга замка. 1978.

Да арт. **Археалогія**. Раскоп на паселішчы Бароўка ў Быхаўскім р-не Магілёўскай вобл.

станаўленне чалавека і гісторыю чалавечага грамадства па матэрыяльных рэштках жыцця і дзейнасці людзей — рэчавых (археал.) помніках. Даследуе ў комплексе стараж. помнікі (*стаянкі*, паселішчы, могільнікі, *свяцілішчы*, майстэрні і інш.), рэчы і іх катэгорыі (прылады працы, прадметы побыту, матэрыялы духоўнай культуры), выяўленыя ў час *археалагічных раскопак*; узнаўляе сац.-эканам. гісторыю эпох, што недастаткова або зусім не адлюстраваны ў пісьмовых крыніцах, даследуе шэраг пытанняў, якія вывучаюцца і сумежнымі навукамі — *этнаграфіяй, антрапалогіяй, палеанталогіяй* і інш.; цесна звязаны з дапаможнымі гіст. дысцыплінамі — *нумізматыкай, сфрагістыкай, эпіграфікай*. А. падзяляецца па эпохах (*каменны век, бронзавы век, жалезны век*, сярэднявечча), часам па крыніцах, культурна-гіст. абласцях, этнічных прыкметах (скіфскі перыяд, антычныя дзяржавы, славянская А.). Паводле храналаг. і тэр. падзелу своеасаблівых рыс помнікаў вылучаюцца т.зв. *археалагічныя культуры*. Важным пытаннем з'яўляецца класіфікацыя і датаванне здабытых пры раскопках рэчаў. У А. выкарыстоўваюць спецыфічныя метады даследавання: параўнальна-тыпалагічны метад (вызначэнне культ. прыналежнасці і храналогіі рэчаў шляхам параўнання з аналагічнымі, але ўжо вядомымі), стратыграфія (умовы залягання культ. пласта археал. помнікаў адносна геал. напластаванняў і інш. пластоў), статыстычны (улік масавых знаходак аднолькавага прызначэння), а таксама розныя метады *археалагічнага датавання*. Важны метад даследавання археал. помнікаў — картаграфаванне. Асобная галіна А. — падводная археалогія — вывучае стараж. і сярэдневяковыя помнікі, што апынуліся пад вадой (у азёрах, рэках, морах). Археал. матэрыялы дапаўняюцца пісьмовымі крыніцамі.

Як навука А. аформілася ў 19 — пач. 20 ст. (да гэтага яна вывучала антычнасць і мела мастацтвазнаўчы кірунак). У краінах Зах. Еўропы цікавасць да нац. гісторыі, у т.л. да А., асабліва ўзмацнілася пасля Вял. франц. рэвалюцыі 1789—93, якая спрыяла абуджэнню нац. самасвядомасці. З павелічэннем колькасці археал. матэрыялаў пачаліся спробы іх класіфікацыі. У 1836 дацкі археолаг К.Ю.Томсен падзяліў помнікі першабытнай эпохі на каменны, бронзавы, жал. вякі, Дж.Лебак падзяліў каменны век на *палеаліт* і *неаліт*. Гэту класіфікацыю паглыбіў Е.Я.Ворса, які вызначыў храналогію бронзавага веку паводле абрадаў пахавання. З гэтага часу А. становіцца навук. дысцыплінай. З 2-й пал. 19 ст. ва ўсіх краінах свету праводзіліся археал. даследаванні; распрацаваны храналагічная і перыядычная сістэмы, навук. метады раскопак; адбываліся археал. з'езды і кангрэсы. У 1869—83 франц. археолаг Г. дэ Мартылье падзяліў палеаліт на перыяды: шэльскі, ашэльскі, мусцьерскі, салютрэйскі, мадленскі. У Еўропе адкрыты эгейскія цывілізацыі дагамераўскай Грэцыі (Г.Шліман, А.Эванс), на Усходзе — шумерская і вавілонская культуры. Шведскі археолаг А.Мантэліус размеркаваў стараж. рэчы па тыпах, якія пазней звязаў у эвалюц. рады, і, такім чынам, стаў заснавальнікам параўнальна-тыпалагічнага метаду. У пач. 20 ст. чэшскі археолаг Л.Нідэрле надрукаваў збор славянскіх старажытнасцяў і даказаў агульныя рысы культуры славян. Дзякуючы даследаванням А.С.Уварава, Д.Я.Самаквасава, Л.К.Іваноўскага, У.І.Сізова, А.А.Спіцына ўзнікла славяна-руская А.

На Беларусі археал. раскопкі пачаліся ў канцы 18 — пач. 19 ст., археал. помнікі даследавалі Т.Нарбут, З.Я.Даленга-Хадакоўскі, К.П. і Я.П.Тышкевічы, А.Г.К.Кіркор, Е.Р.Раманаў, У.З.Завітневіч, В.А.Шукевіч, М.Ф.Кусцінскі, М.М.Турбін, Г.Х.Татур, Л.Ю.Лазарэвіч-Шапялевіч, З.Глогер, М.В.Фурсаў, С.Ю.Чалоўскі і інш. На актывізацыю археал. даследаванняў паўплываў 9-ы археал. з'езд у Вільні (1893). У 1925 пры Інбелкульце створана гісторыка-археал. камісія, у 1927 адкрыта кафедра археалогіі (з 1929 археал. камісія ў Ін-це гісторыі Бел. АН, з 1932 секцыя археалогіі). У даваенны час археал. даследаванні праводзілі А.М.Ляўданскі, К.М.Палікарповіч, С.А.Дубінскі, А.Дз.Каваленя, І.А.Сербаў, С.С.Шутаў і інш. У 1930-я г. многія археолагі рэпрэсіраваны і загінулі (Ляўданскі, Дубінскі, Каваленя і інш.). У Зах. Беларусі археал. раскопкі праводзілі У.Галубовіч, Г.Цэгак-Галубовіч, З.Шміт, З.Дурчэўскі і інш. У 1944 у Ін-це гісторыі АН Беларусі створаны сектар археалогіі, з 1980 — аддзел археалогіі з сектарамі, у 1986 сектары пераўтвораны ў аддзелы. У 1973 створана кафедра археалогіі, этнаграфіі і дапаможных гіст. дысцыплін у БДУ. Бел. археолагі выявілі каля 1300 помнікаў каменнага і бронзавага вякоў, вызначылі іх прыналежнасць да археал. культур (У.Дз.Будзько, У.Ф.Ісаенка, М.М.Чарняўскі, У.П.Ксяндзоў, А.Г.Калечыц, Э.М.Зайкоўскі, В.Ф.Капыцін і інш.), праводзілі мэтанакіраванае вывучэнне помнікаў, культур і этнічных утварэнняў жал. веку (А.Р.Мітрафанаў, Л.Д.Побаль, К.П.Шут, В.І.Шадыра, В.С.Вяргей, М.І.Лашанкоў і інш.). Даследаванні бел. археолагаў дапамаглі ўзнавіць працэс фарміравання ўсх.-слав. племянных аб'яднанняў (дрыгавічоў, крывічоў, радзімічаў), гісторыю стараж. гарадоў (В.Р.Тарасенка, Г.В.Штыхаў, Э.М.Загарульскі, П.Ф.Лысенка, Я.Г.Звяруга, М.А.Ткачоў, З.С.Пазняк, Т.С.Бубенька, В.М.Ляўко, Л.У.Калядзінскі, В.Е.Собаль, Ю.А.Заяц і інш.), матэрыяльную культуру сельскага насельніцтва (Л.У.Дучыц, Я.Р.Рыер, У.У.Багамольнікаў, Т.М.Каробушкіна і інш.). У апошняе дзесяцігоддзе актыўна вывучаліся познасярэдневяковыя помнікі 14—18 ст. (А.А.Трусаў, А.К.Краўцэвіч, В.У.Шаблюк, І.М.Чарняўскі і інш.). Археал. даследаванні на Беларусі праводзілі супрацоўнікі Ін-таў археалогіі і гісторыі матэрыяльнай культуры Расійскай АН (Л.В.Аляксееў, І.І.Арцёменка, Ф.Д.Гурэвіч, Н.М.Гурына, Ю.У.Кухарэнка, В.М.Мельнікоўская, П.А.Рапапорт, Г.Ф.Салаўёва, Э.А.Сымановіч, В.В.Сядоў, П.М.Трацякоў).

*Літ.:* Очерки по археологии Белоруссии.

Да арт. Археалогія. Пантыкапей, рэшткі збудавання 2 ст. да н.э.



Энцыклапедыя «Археалогія і нумізматыка Беларусі». Вокладка.

Ч. 1—2. Мн., 1970—72; Каханоўскі Г.А. Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI—XIX стст. Мн., 1984; Белорусская археология: Достижения археологов за годы Советской власти. Мн., 1987; Вяргей В.С. Археалагічная навука ў БССР, 1919—1941 гг. Мн., 1992; Археалогія і нумізматыка Беларусі: Энцыкл. Мн., 1993.

*Г.В.Штыхаў.*

**«АРХЕАЛО́ГІЯ І НУМІЗМА́ТЫКА БЕЛАРУ́СІ»**, аднатомная галіновая энцыклапедыя. Падрыхтавана і выдадзена выд-вам *«Беларуская Энцыклапедыя»* ў 1993. У сістэматызаваным выглядзе і алфавітным парадку ў ёй падаюцца звесткі па гісторыі бел. археал. і нумізматычнай навукі. Аб'екты апісання — выяўленыя на працягу апошніх 250 гадоў археолагамі розных краін помнікі матэрыяльнай культуры далёкіх продкаў беларусаў, усе манеты і боны, што хадзілі на тэр. Беларусі. Уключае аглядныя нарысы па бел. археалогіі і нумізматыцы і больш за 2,3 тыс. энцыклапедычных артыкулаў; спіс л-ры (1756 назваў) на бел., рус., англ., польскай, ням., італьян., літ., чэшскай, швед. і інш. мовах. Артыкулы ілюстраваны здымкамі, картамі, планамі, схемамі.

*В.К.Шчэрбін.*

**АРХЕАЛО́ГІЯ МУЗЫ́ЧНАЯ**, галіна музычна-гістарычнай навукі, якая распрацоўвае праблемы музычнай культуры старажытнага свету на аснове археал. матэрыялаў; частка агульнай *археалогіі*. Сярод археал. матэрыялаў муз. інструменты (або іх фрагменты) з каменю, косці, гліны, металу, помнікі стараж. выяўл. мастацтва з муз. сюжэтамі (наскальныя малюнкі, фрэскі, каменная і гліняная скульптура). Пачынальнік А.м. — ням. музыказнавец і этнограф К.Закс (1930—40-я г.). Наконт зместу, межаў і магчымасцяў А.м. існуюць розныя погляды. Адны даследчыкі (Я.Браўда, Расія) абмяжоўваюць яе вывучэннем аб'ектаў муз. матэрыяльнай культуры (муз. інструментаў), іншыя (Закс, рус. музыказнавец М.Фіндэйзен) пашыраюць яе і на даследаванні рэліктавых узораў нар. музыкі, помнікаў нотнага пісьма стараж. эпох. На Беларусі даследаванні па А.м. вядуцца ў межах агульнай археалогіі.

*Літ.:* Садоков Р. Археологические источники в изучении музыкальной культуры древнего мира // Народные музыкальные инструменты и инструментальная музыка: Сб. статей и материалов. М., 1987. Ч. 1; Археалогія і нумізматыка Беларусі: Энцыкл. Мн., 1993. С. 93—94, 446.

*І.Дз.Назіна.*

**АРХЕАЛО́ГІЯ ПО́МНІКАЎ АРХІТЭКТУ́РЫ**, галіна *археалогіі*, якая вызначае месцазнаходжанне рэштак загінулых або значна перароблены помнікаў архітэктуры, вывучае іх, аднаўляе планы і, па магчымасці, рэканструюе фасады і асн. аб'ёмы помнікаў у цэлым.

Да 19 ст. манум. архітэктуру вывучалі гісторыкі архітэктуры і мастацтвазнаўцы, археал. даследаванні мелі дапаможны характар. У 1820—40-я г. ў Зах. Еўропе, у канцы 19 — пач. 20 ст. ў Расіі пачаліся навук. даследаванні арх. помнікаў. У 1930—40-я г. вылучылася ў асобную галіну археалогіі. У пасляваен. гады распрацавана методыка археал. вывучэння арх. аб'ектаў, праводзіцца сумеснае іх даследаванне аб'яднанымі экспедыцыямі археолагаў, архітэктараў-рэстаўратараў, гісторыкаў архітэктуры і мастацтвазнаўцаў.

На Беларусі першыя археал. даследаванні арх. помніка зроблены невяд. археолагам у 1790-я г. ў Полацку, у выніку якіх раскапаны падмуркі храма-трыконха *Бельчыцкага Барысаглебскага манастыра* 12 ст. У 1-й пал. 19 ст. праводзілася візуальнае мастацтвазнаўчае і гіст. архіўнае вывучэнне помнікаў архітэктуры. Рус. і польск. даследчыкі абследавалі шмат помнікаў, зрабілі іх пач. абмеры, вывучалі буд. матэрыялы і сістэмы муровак, сабралі вял. фактаграфічны матэрыял па гісторыі бел. архітэктуры і спрабавалі яго крытычна асэнсаваць. Часам даследаванні спалучаліся з рамонтна-рэстаўрацыйнымі работамі. А.п.а. актывізавалася ў канцы 1920—1-й пал. 1930-х г. (працы І.Хозерава, М.Шчакаціхіна). На высокім навук. узроўні праведзены раскопкі полацкіх арх. помнікаў 12 ст., што дазволіла вылучыць іх у самастойную *Полацкую школу дойлідства*. У пасляваенны перыяд раскопкі М.Вароніна, М.Каргера, П.Рапапорта, В.Булкіна далі магчымасць па-новаму ўбачыць і растлумачыць складаныя працэсы станаўлення і развіцця архітэктуры зах. зямель Стараж. Русі. З канца 1960-х г. пачаліся раскопкі помнікаў 13—18 ст., вынікі іх надрукаваны ў працах М.Ткачова і М.Малеўскай. У апошні час шырока вывучаецца культавая і грамадзянская архітэктура эпохі Адраджэння і барока (раскопкі І.Чарняўскага, З.Пазняка, А.Кушнярэвіча і інш.).



Да арт. **Археалогія помнікаў архітэктуры.** Муроўка Гродзенскай Барысаглебскай царквы. 12 ст.

*Літ.:* Михайловский Е.В. Реставрация памятников архитектуры. М., 1971; Раппопорт П.А. О методике археологических раскопок памятников древнерусского зодчества // Краткие сообщения Ин-та археологии АН СССР. М., 1973. Вып. 135; Трусов О.А. Памятники монументального зодчества Белоруссии XI—XVII вв.: Архит.-археол. анализ. Мн., 1988.

*А.А.Трусаў.*

**АРХЕАЛО́ГІЯ ЦАРКО́ЎНАЯ**, багаслоўская дысцыпліна, якая займаецца пошукам і вывучэннем рэчаў і помнікаў, звязаных з гісторыяй хрысціянскай царквы. Прадметам А.ц. з'яўляецца таксама аднаўленне і апісанне геагр., побытавага і інш. фону, на якім адбываліся біблейскія падзеі. Выкладаецца ў духоўных навуч. установах пад назвай «Царкоўная археалогія ў сувязі з гісторыяй хрысціянскага мастацтва». Трэба адрозніваць А.ц. ад т.зв. «Археалогіі біблейскай», мэта якой на аснове археал. раскопак на тэр. стараж. Палесціны, Месапатаміі, Егіпта, Міжземнамор'я даказаць міфалагічны характар біблейскіх сказанняў, асобных тэкстаў і сюжэтаў Старога і Новага Запавету.

**АРХЕАМАГНЕТЫ́ЗМ**, гл. *Палеамагнетызм*.

**АРХЕАПТЭ́РЫКС**, археорніс, першаптушка (Archaeopteryx), самы стараж. вымерлы род птушак падкл. яшчарахвостых птушак. 1 від — A.lithographica. Назва дадзена па адбітку пяра, знойдзеным у 1860 у верхнеюрскіх (цітонскіх) літаграфічных сланцах Золенгофена (Баварыя, Германія). У 1861 там знайшлі і першы няпоўны яго шкілет з адбіткамі пер'я. Вядома 5 шкілетаў; 1 экз. (берлінскі) апісаны пад назвай археорніс, але ён ідэнтычны з А.

Памерамі з голуба, меў дзюбу з канічнымі зубамі, 3 свабодныя пальцы на крылах, доўгі хвост з 20 пазванкамі. Мяркуюць, што А. пералятаў з дрэва на дрэва, пры гэтым выкарыстоўваў пальцы крылаў, або бегаў па зямлі і зрэдку пералятаў на невял. адлегласці. Марфалогія А. пацвярджае філагенетычныя сувязі паўзуноў і птушак. Мяркуюць, што А. — прамы продак птушак, які паходзіць ад тэраподных дыназаўраў ці ад псеўдазухій.

**Археаптэрыкс.**

**АРХЕАПТЭ́РЫКСАВАЯ ФЛО́РА**, існавала ў познім дэвоне. Змяніла ксілафітавую флору. Вылучана па знаходках у Еўразіі, Паўн. Амерыцы, Аўстраліі. На Беларусі прадстаўнікі А.ф. выяўлены на ПдУ, у Прыпяцкай упадзіне ў адкладах позняга фамену (азёрска-хаванскія слаі). Складалася з папарацепадобных, дзеразовых і членістасцябловых, у канцы дэвону з'явіліся прымітыўныя голанасенныя (*птэрыдаспермы*) расліны. Развіваліся сумчатыя грыбы і нематафіты. Складам і разна-

стайнасцю відаў А.ф. блізкая да раннекаменнавугальнай.

**АРХЕАЦЫЯ́ТЫ** (Archaeocyatha), тып вымерлых прымітыўных беспазваночных жывёл. Больш за 1 тыс. відаў. Жылі ва ўсіх морах ранняга кембрыю на глыб. да 100 м.

Даўж. 1—10 см (рэдка 40—150 см), дыям. 1—10 см (рэдка 40—80 см). Вапнавы порысты шкілет меў форму кубка або рога (грэч. kýathos кубак, адсюль назва). Адзіночныя, радзей каланіяльныя формы. Вялі прымацаваны спосаб жыцця, зрэдку ствараліпершыя стараж. рыфы. Рэшткі А. з'яўляюцца вызначальнымі выкапнямі для кембрыйскіх адкладаў.

**АРХЕБАКТЭ́РЫІ**, мікраарганізмы пракарыётнага тыпу. Адкрыты ў 1970-я г. Ад іншых *пракарыётаў* адрозніваюцца хім. будовай макрамалекул, напр. нуклеатыднымі паслядоўнасцямі 16S рыбасамальнай РНК, саставам мембранных ліпідаў, клетачных сценак і інш., і здольнасцю ажыццяўляць унікальныя біяхім. працэсы. Поруч з *эўкарыётамі* і *эўбактэрыямі* (сапраўдныя бактэрыі) складаюць адзін з кірункаў клетачнай эвалюцыі. Уключаюць бактэрыі, якія існуюць у экстрэмальных умовах: метанаўтваральныя А., экстрэмальныя галафілы (існуюць пры высокіх канцэнтрацыях хларыду натрыю), А. без клетачнай сценкі, А., што аднаўляюць сульфаты, і экстрэмальныя тэрмафілы, якія метабалізуюць малекулярную серу. Хемалітатрофныя віды А. перспектыўныя для выкарыстання ў біягідраметалургіі, а таксама для абяссервання некандыцыйнага каменнага вугалю; метанаўтваральныя А. могуць быць карысныя як прадуцэнты вітаміну $B_{12}$ і метану.

*А.М.Капіч.*

**АРХЕГО́НІЙ** (ад грэч. archē пачатак + gonē нараджэнне), жаночы орган палавога размнажэння ў моха- і папарацепадобных, некаторых голанасенных раслін, водарасцяў і грыбоў. Па наяўнасці А. яны вылучаюцца ў асобную групу раслін — археганіятаў. У імхоў мае выгляд колбы: у пашыранай брушной частцы знаходзіцца яйцаклетка, над ёй брушная канальцавая клетка, у вузкай — шэраг дробных шыйных канальцавых клетак, якія расплываюцца ў слізь, раскрываюць шыйку А. і садзейнічаюць пранікненню да яйцаклеткі сперматазоідаў.

**АРХЕ́Й** (ад грэч. archaios старажытны), архейская эра і група, самая стараж. эра ў геал. гісторыі Зямлі і адпаведная група парод *дакембрыю*. Пачалася пасля завяршэння фарміравання Зямлі і доўжылася да 2,5 млрд. гадоў назад (працягласць каля 2 млрд. гадоў). Назву ўвёў амер. геолаг Дж. Дана ў 1872. У А. ўтварылася складана пабудаваная і перапрацаваная магматычнымі і метамарфічнымі працэсамі тоўшча горных парод, сабраная ў складкі і перарваная інтрузіямі. Пароды А. ўваходзяць у склад крышт. фундамента старадаўніх *платформаў*, выходзяць на паверхню Зямлі на іх шчытах (*Балтыйскі шчыт*, *Украінскі шчыт*, Канадскі, Бразільскі і інш.) і ў сярэдзінных масівах геасінклінальных паясоў. Сярод метамарфічных парод А. пашыраны гнейсы, крышт. сланцы, амфібаліты, кварцыты, у т.л. жалезістыя, мармуры і слабаметамарфізаваныя зялёнасланцавыя пароды; сярод магматычных — граніты, гранадыярыты, дыярыты, габра, каматыіты і інш. У пародах А. трапляюцца рэшткі аднаклетачных водарасцяў (узрост каля 3 млрд. гадоў). Тыповымі рэгіянальнымі стратыграфічнымі падраздзяленнямі А. для Усходне-Еўрапейскай платформы прыняты саамскі (беламорскі) і лопскі комплексы. На Беларусі вылучаюць шчучынскую і кулажынскую серыі. Пароды А. залягаюць на рознай глыбіні: 80—160 м на *Беларускай антэклізе*, да

**Архегоній**: 1 — імху; 2 — папараці; 3 — два архегоніі хвоі.

6000 м у *Прыпяцкім прагіне*. З А. звязаны радовішчы храмітаў і жалеза, медна-нікелевых і медна-калчаданавых рудаў, марганцу, золата, карунду, графіту і інш., на Беларусі — ільменіт-магнетытавыя руды Навасёлкаўскага радовішча.

*І.В.Найдзенкаў.*

**АРХЕО́РНІС**, вымерлая птушка, тое, што *археаптэрыкс*.

**АРХЕТЫ́П** (ад грэч. archē пачатак + typos вобраз), агульначалавечы першавобраз, персанаж, што паслядоўна паўтараецца ў міфах, літаратуры і індывідуальным мысленні; спосаб сувязі вобразаў, што пераходзяць з пакалення ў пакаленне; цэнтр. паняцце *аналітычнай псіхалогіі*. Ідэю А. ў аб'ектыўна-ідэаліст. форме можна знайсці ў творах Платона, Аўтусціна, схаластаў. Як навук. тэрмін «А.» уведзены швейц. псіхолагам К.Г.*Юнгам* і адаптаваны філасофіяй, літаратура- і мастацтвазнаўствам, тэорыяй міфалогіі, фальклярыстыкай і інш. Паводле тэорыі Юнга пра калект. неўсвядомленае, мадэлі чалавечага вопыту пэўным чынам генетычна закадзіраваны і пераходзяць да наступных пакаленняў. Тоесныя архетыпныя матывы і вобразы (сімвал сусветнага дрэва ці міф пра патоп) сустракаюцца ў няроднасных культурах і сферах мастацтва, што тлумачыцца іх універсальным і пастаянным пачаткам у чалавечай прыродзе. Маючы выток у далагічным мысленні, А. выклікае аналагічныя пачуцці і асацыяцыі і ў аўтара твора, і ў спажыўца незалежна ад разбежкі ў часе. А. ляжыць у аснове сімволікі творчасці, розных рытуалаў, сноў і інш.

*І.М.Дубянецкая.*

**АРХІ...** (ад грэч. archi... старшы, галоўны), прыстаўка, якая абазначае найвышэйшую ступень чаго-н., напр., *архіепіскап*, *архіпастыр*.

**АРХІВАЗНА́ЎСТВА**, комплексная дысцыпліна, якая вывучае гісторыю, арганізацыю, тэорыю і практыку работы *архіваў* у галіне ўліку, апісання, выкарыстання, забеспячэння захаванасці дакументаў, навук. арганізацыі працы і эканомікі архіўнай справы. Практычнае А. як набор правілаў па захаванні, уліку і выкарыстанні дакументаў існуе з глыбокай старажытнасці.

У 16—18 ст. у краінах Зах. Еўропы склалася «навука пра архівы», якая вызначала іх месца ў дзярж. апараце, класіфікацыю дакументаў, іх апісанне і выкарыстанне для практ. мэтаў; з канца 18 ст. распрацоўваліся пытанні камплектавання, захаванасці з мэтаю навук. выкарыстання дакументаў і экспертызы. Да канца 19 ст. А. аформілася ў самаст. навук. дысцыпліну, з'явіліся нац. школы А. З пач. 20 ст. ў А. ўвайшлі паняцці фондавага прынцыпу класіфікацыі дакументаў, камплектавання архіваў кінафотафонадакументаў і інш.; з сярэдзіны 20 ст. выкарыстоўваюцца аўтаматызаваныя сістэмы пошуку дакумент. інфармацыі. У б. СССР вынікі распрацовак друкавалі ў час. «Советские архивы», «Трудах Всесоюзного научно-исследовательского института документоведения и архивного дела» і інш.

На Беларусі распрацоўка пытанняў А. вядзецца ў Бел. н.-д. цэнтры дакументазнаўства, археаграфіі і архіўнай справы, дзярж. архівах. Як спец. гіст. дысцыпліна А. выкладаецца на гіст. ф-тах універсітэтаў.

*Літ.:* Вопросы архивоведения и источниковедения в БССР. Мн., 1971.

**АРХІВА́РЫУС**, супрацоўнік *архіва*, хавальнік архіўных дакументаў.

**«АРХИ́ВНОЕ ДЕ́ЛО»**, часопіс цэнтральных архіўных устаноў СССР і РСФСР. Выдаваўся ў 1923—41 (акрамя 1934) у Маскве на рус. мове. У ім друкаваліся пастановы і інструкцыі па архіўнай справе, дакумент. матэрыялы, водгукі на сав. і замежныя кнігі па архіўнай справе, інфармацыя пра выданні цэнтр. архіваў, стан замежных архіваў, абмяркоўваліся метадычныя пытанні. Выйшла 58 нумароў.

**АРХІВО́ЛЬТ** (італьян. archivolto), архітэктурна-дэкаратыўная дэталь абрамлення арачнага праёма; вылучае дугу *аркі* з плоскасці сцяны. А. з'явіліся з развіццём арачных канструкцый у Стараж. Рыме і Візантыі; на Беларусі пашыраны ў архітэктуры стыляў готыкі, рэнесансу, барока, класіцызму. Выконваюць А. з клінавых камянёў, тынку, стука. Мае прафіляваную паверхню з выкарыстаннем розных па малюнку *абломаў архітэктурных* або арнаментаваную разьбой, рустам, лепкай. А., які самастойна выступае на плоскасці сцяны і не звязаны з праёмам, называецца «сляпой» аркай.

**АРХІДА́М II** (Archidamos; ? — 427 ці 426 да н.э.), цар Спарты [469 ці 476 — 426 да н.э.]. На чале спартанскага войска задушыў паўстанне *ілотаў* 464—458 ці 455 (гл. *Месенскія войны*). На пач. *Пелапанескай вайны* кіраваў паходамі ў Атыку (у 431, 430 і 428) і Платэі (429). Па яго імю гэты перыяд вайны наз. Архідамавай вайной.

**АРХІЕПІ́СКАП** (ад *архі...* + *епіскап*), духоўная асоба вышэйшай ступені хрысціянскай царк. іерархіі. Тытул уведзены ў Рымскай імперыі ў 4 ст. З заснаваннем патрыярхатаў прысвойваўся патрыярхам і мітрапалітам аўтакефальных епархій. Першы на Русі тытул А. атрымаў епіскап наўгародскі ў 1165. На Беларусі першым А. стаў у пач. 16 ст. епіскап Полацкай епархіі. У 1994 на Беларусі 2 А. (праваслаўнай і рымска-каталіцкай царквы).

**АРХІКА́РП** (ад *архі...* + грэч. karpos плод), жаночы палавы орган у многіх сумчатых грыбоў (*аскаміцэтаў*). Складаецца з 2 частак: ніжняй, акругла-ўспушанай (аскагон), у якой адна ці некалькі буйных, часта мнагаядзерных клетак, і верхняй больш-менш выцягнутай цыліндрычнай (трыхагіна), праз якую мужчынскія палавыя клеткі пранікаюць у аскагон. Пасля гэтага з А. вырастаюць гіфы, на канцах якіх утвараюцца сумкі (*аскі*) са спорамі.

**АРХІЛО́Х** (Archilochos), старажытнагрэчаскі паэт-лірык 2-й пал. 7 ст. да н.э. Нарадзіўся на в-ве Парос. Вёў вандроўніцкае жыццё, быў воінам-наёмнікам. Браў за ўзор паэзію Гамера, але супрацьпастаўляў эпічнаму ідэалу вобраз індывідуалізаванага чалавека. У яго сатыр. ямбах, элегіях, эпіграмах, гімнах (захаваліся ва ўрыўках) — роздум пра зменлівасць лёсу, гонар, доблесць, пасмяротную славу. Творчасць А. адметная разнастайнасцю жанраў і рытмаў (упершыню выкарыстаў ямб). На радзіме ў гонар А. было пабудавана свяцілішча (уцалелі рэшткі з надпісамі — біяграфічныя звесткі пра А. і ўрыўкі з яго вершаў).

*Тв.:* Рус. пер. — у кн.: Эллинские поэты. М., 1963.

**АРХІМАНДРЫ́Т** (ад грэч. archimandritēs), вышэйшы духоўны сан у манахаў правасл. царквы. У А. пасвячаюць настаяцеляў вял. мужчынскіх манастыроў, рэктараў духоўных семінарый, кіраўнікоў духоўных місій.

**АРХІМЕ́Д** (Archimēdēs; каля 287, Сіракузы — 212 да н.э.), старажытнагрэчаскі вучоны; адзін з заснавальнікаў матэматыкі і механікі. Распрацаваў матэм. метады вызначэння плошчаў паверхняў і аб'ёмаў розных фігур і целаў, на аснове якіх створаны дыферэнцыяльнае і інтэгральнае злічэнні. Вызначыў суму бесканечнай геам. прагрэсіі з назоўнікам $^1/_4$ (першы прыклад бесканечнага шэрагу ў матэматыцы); даследаваў уласцівасці *архімедавай спіралі*, стварыў тэорыю паўправільных выпуклых мнагаграннікаў (целы А.); пабудаваў злічэнне, якое дазваляла запісваць і называць даволі вял. лікі; з вял. дакладнасцю вызначыў лік $\pi$ і межы яго памылкі: $3\frac{10}{71} < \pi < 3\frac{1}{7}$; даў вызначэнне



Архівольт аркі галоўнага партала Мінскага паштамта.

цэнтра цяжару цела; сфармуляваў *Архімеда аксіёму*. А. заклаў асновы гідрастатыкі і сфармуляваў яе асн. палажэнні (гл. *Архімеда закон*). Вынайшаў сістэму рычагоў, блокаў, паліспастаў і вінтоў для падымання цяжкіх прадметаў, машыну для абваднення палёў (*архімедаў вінт*), ваенную кідальную машыну, прыладу для вызначэння бачнага (вуглавога) дыяметра Сонца, мех. мадэль нябеснай сферы, якая дазваляла назіраць рух планет, фазы Месяца, зацьменні Сонца і Месяца, і інш. А. быў блізкі да сіракузскага цара Гіерона II, у час вайны супраць Рыма кіраваў абаронай Сіракузаў і быў забіты рымлянамі.

Архімедава спіраль: 1 — $\varphi < 0$; 2 — $\varphi > 0$.

*Літ.:* Голин Г.М., Филонович С.Р. Классики физической науки (с древнейших времен до начала XX в.). М., 1989.



Архімед.

**АРХІМЕ́ДА АКСІЁМА**, зводзіцца да таго, што пры паўтарэнні дастатковай колькасці разоў меншага з двух зададзеных адрэзкаў можна атрымаць адрэзак, большы за большы з іх (сфармулявана *Архімедам*). Адносіцца таксама да плошчаў, аб'ёмаў, лікаў і інш. У агульным выпадку, калі $A$ і $B$ — два значэнні адной і той жа велічыні і $A < B$, можна заўсёды знайсці такі цэлы лік $m$, што $Am > B$; на гэтым заснаваны працэс паслядоўнага дзялення ў арыфметыцы і геаметрыі. У 19 ст. выявілася існаванне т.зв. неархімедавых велічынь, у дачыненні да якіх А.а. не выконваецца (напр., вектары, для якіх паняцце няроўнасці страчвае сэнс).

**АРХІМЕ́ДА ЗАКО́Н**, асноўны закон *гідрастатыкі* і *аэрастатыкі*, паводле якога на кожнае цела, апушчанае ў вадкасць (газ), дзейнічае выштурхная сіла, накіраваная ўверх, роўная па модулі вазе выціснутай гэтым целам вадкасці (газу) і прыкладзеная да цэнтра цяжару апушчанай у вадкасць (газ) часткі цела. Адкрыты ў 3 ст. да н.э. *Архімедам*. А.з. — аснова тэорыі і практыкі плавання целаў. З яго ўлікам будуюцца аэрастаты, дырыжаблі, падводныя лодкі і інш.

**АРХІМЕ́ДА ЦЕ́ЛЫ**, тое, што *паўправільныя мнагаграннікі*.

**АРХІМЕ́ДАВА СПІРА́ЛЬ**, крывая, якую апісвае пункт пры руху з пастаяннай скорасцю па прамой, што раўнамерна паварочваецца ў плоскасці вакол аднаго са сваіх пунктаў. Названа ў гонар *Архімеда*. Калі пункт О лічыць полюсам, а прамую з выбраным на ёй напрамкам за палярную вось, то ўраўненне А.с. ў палярных каардынатах: $\rho=\alpha\varphi$, дзе $\alpha = {}^{V}/_{\omega}$ (V — лінейная, $\omega$ — вуглавая скорасці). А.с. мае 2 галіны: суцэльную ($\varphi > 0$) і штрыхавую ($\varphi < 0$).

**АРХІМЕ́ДАЎ ВІНТ**, водападымальная машына, вынайдзеная *Архімедам* у 3 ст. да н.э. Уяўляе сабой вал з вінтавой паверхняй, устаноўлены ў нахіленай трубе, ніжні канец якой апушчаны ў ваду. Пры вярчэнні (напр., ад ветравога кола ці інш. рухавіка) вінтавая паверхня вала перамяшчае ваду ўверх па трубе (на вышыню да 3—4 м).

І.К.Архіпава.

**АРХІ́ПАВА** Ірына Канстанцінаўна (н. 2.12.1925, Масква), руская спявачка (мецца-сапрана). Нар. арт. СССР (1966). Герой Сац. Працы (1984). Скончыла Маскоўскую кансерваторыю (1953), з 1976 выкладае ў ёй (з 1982 праф.). З 1954 салістка Свярдлоўскага т-ра оперы і балета, у 1956—88 — Вял. т-ра Расіі. Вядомая прадстаўніца рус. школы бельканта. Сярод партый: Кармэн («Кармэн» Ж.Бізэ, спявала з М. дэль Монака), Амнерыс («Аіда» Дж. Вердзі), Марфа («Хаваншчына» М.Мусаргскага), Любаша («Царская нявеста» М.Рымскага-Корсакава). Спявала ў Міланскім т-ры «Ла Скала» і інш. Старшыня цэнтр. праўлення Усерас. муз. т-ва (з 1986). Ленінская прэмія 1978.

*Літ.:* Попов И.Е. И.Архипова: Творческий портрет. М., 1981.

Выкарыстанне архімедавага вінта для перамяшчэння вады: 1 — труба; 2 — архімедаў вінт; 3 — ветравы рухавік.

**АРХІПА́СТЫР**, агульная назва для свяшчэннаслужыцеляў вышэйшай (трэцяй) ступені хрысціянскай царк. іерархіі: *епіскапаў, архіепіскапаў, мітрапалітаў, экзархаў, патрыярхаў*. Выкарыстоўваецца нароўні з назвамі «архірэй», «іерарх».

**АРХІ́ПАЎ** Абрам Яфімавіч (другое прозвішча Спірыкаў; 27.8.1862, в. Ягорава Разанскай вобл. — 25.9.1930), рускі жывапісец. Правадз. чл. Пецярбургскай АМ (1916). Нар. мастак Рэспублікі (1927). У 1884—86 вучыўся ў Пецярбургскай АМ. Перасоўнік (з 1891), чл. Саюза рус. мастакоў (з 1904), Асацыяцыі мастакоў Расіі (з 1924). З 1894 выкладаў у навуч. установах Масквы. Аўтар карцін: «Па этапах» (1893), «Прачка» (1890-я г.), партрэтаў (пераважна сялян; «Маладая сялянка ў чырвоным», 1925), пейзажаў «Па рацэ Ацэ» (1890), «Лёд прайшоў» (1895) і інш.

**АРХІПЕЛА́Г** (італьян. arcipelago), значная група астравоў, якія размешчаны

А.Архіпаў. Маладая сялянка ў чырвоным. 1925. Нацыянальны мастацкі музей Беларусі.

паблізу адзін ад аднаго і звычайна разглядаюцца як адно цэлае. Астравы аднаго А. найчасцей маюць аднолькавае паходжанне (мацерыковае, вулканічнае, каралавае) і падобную геал. будову (гл., напр., Канадскі Арктычны архіпелаг, Гавайскія а-вы, Маршалавы а-вы).

**АРХІПЕЛА́ГСКІЯ ЭКСПЕДЫ́ЦЫІ РУ́СКАГА ФЛО́ТУ**, тры паходы рас. Балт. флоту ў Міжземнае мора і яго бакавыя дзеянні ў раёне Грэчаскага архіпелага ў 2-й пал. 18 — пач. 19 ст. 1-я экспедыцыя (1769—74) праведзена ў час рус.-тур. вайны 1768—74 для нанясення ўдару па прыморскіх пунктах і адцягнення часткі тур. сіл з дунайскага і крымскага напрамкаў. 2 рас. эскадры на чале з адм. Р.А.Спірыдавым і контр-адм. Эльфінстонам прыбылі ў Эгейскае м., у баях у Хіяскім праліве (24.6.1770) і Чэсменскай бухце (26.6.1770) разгромілі тур. флот адм. Хасан-бея і блакіравалі праліў Дарданелы (да 1773). 2-я экспедыцыя (1806—07) адбылася ў час рус.-тур. вайны 1806—12. Рас. эскадра і грэч. флатылія пад агульным камандаваннем віцэ-адм. Дз.М.Сянявіна блакіравалі Дарданелы і ў бітвах каля іх, в-ва Лемнас і Афонскага п-ва (1807) разгромілі тур. флот. У ходзе 3-й экспедыцыі (1827) аб'яднаныя брыт., рас. і франц. эскадры пад агульным камандаваннем брытанскага віцэ-адм. Кодрынгтана перамаглі тур.-егіп. флот у Наварынскай бухце (8.10.1827). Экспедыцыі паскорылі заканчэнне рус.-тур. войнаў, садзейнічалі нац.-вызв. барацьбе грэч. народа супраць тур. панавання.

**АРХІ́ПЕНКА** (Archipenko) Аляксандр Парфір'евіч (30.5.1887, Кіеў — 25.2.1964), скульптар. Вучыўся ў Кіеўскім маст. вучылішчы (1902—05). Жыў у Парыжы, Берліне, з 1923 — у ЗША. Выкладаў у студыях, ун-тах і ін-тах мастацтваў ЗША. Знаходзіўся пад уплывам кубізму («Медрана», 1914), канструктывізму, абстрактнага мастацтва. Першы выкарыстаў камбінацыі разнародных матэрыялаў (шкло, метал, дрэва, цэлулоід і інш.). У 1915—20 распрацаваў стыль, заснаваны на трохмернай скульптуры і рэльефе з рамай, фонам і інш. элементамі жывапісу («Эспаньёла», 1916, і інш.); стварыў шэраг «торсаў» з металу і каменю («Торс», 1914). У 1920—30 стварыў рэаліст. скульптуры («Дыяна», «Маладая жанчына», партрэты Т.Шаўчэнкі, І.Франко, Т.Уайлдэра і інш.). У 1924—27 распрацаваў і запатэнтаваў механізм для стварэння ілюзіі руху намаляваных аб'ектаў, якія назваў «архіпентура»; у 1940-я г. пачаў серыю т.зв. «святломадулятараў» — плексігласавых паўпразрыстых скульптур, асветленых знутры; эксперыментаваў у галіне «гукавой скульптуры». У 1960-я г. стварыў бронзавыя скульптуры «Царыца Саўская», «Цар Саламон», серыю літаграфій «Жывыя формы».

*Літ.:* Северюхин Д.Я., Лейкинд О.Л. Художники русской эмиграции (1917—1941): Биогр. словарь. Спб., 1994. С. 41—44.

**АРХІ́ПЕНКА** Валерый Іванавіч (н. 29.1.1942, пас. Фершампенуаз Чэлябінскай вобл., Расія), фізік. Д-р фізіка-матэм. н. (1993). Скончыў БДУ (1964). З 1965 у Ін-це фізікі, з 1993 у Ін-це малекулярнай і ат. фізікі АН Беларусі. Навук. працы па фізіцы газавага разраду і ўзаемадзеянні эл.-магн. хваляў з плазмай, аптычным прыладабудаванні.

*Тв.:* Экспериментальное исследование механизма абсолютной параметрической неустойчивости неоднородной плазмы (у саўт.) // Журн. эксперим. и теор. физики. 1987. Т. 93, вып. 10.

**АРХІ́ПЕНКА** Фёдар Фёдаравіч (н. 30.10.1921, в. Аўсімавічы Бабруйскага

р-на), Герой Сав. Саюза (1945). Скончыў Адэскую ваен. школу пілотаў (1939), Ваен.-паветр. акадэмію (1951), Маскоўскі інж.-эканам. ін-т (1967). У Вял. Айч. вайну з чэрв. 1941 на Паўд.-Зах., Зах., Бранскім, Сталінградскім, Варонежскім, 2-м і 1-м Укр. франтах, лётчык-знішчальнік. Удзельнік баёў пад Сталінградам, на Курскай дузе, вызвалення Украіны, Малдовы, Польшчы, Прагі, штурму Берліна. Зрабіў 467 баявых вылетаў, правёў 102 паветр. баі, збіў 44 варожыя самалёты. Да 1959 у Сав. Арміі.

**АРХІРЭ́Й** (ад *архі...* + грэч. hiereus святар), агульная назва духоўных асоб вышэйшай ступені правасл. царк. іерархіі (*епіскап, архіепіскап, мітрапаліт, патрыярх*). Могуць быць епархіяльнымі (якія правяць) і вікарнымі (іх памочнікамі). Сінонім тэрміна «А.» — архіпастыр.

**АРХІРЭ́ЙСКІЯ ШКО́ЛЫ**, епархіяльныя школы, ніжэйшыя агульнаадукацыйныя саслоўныя (пераважна для дзяцей святароў) навуч. ўстановы. Існавалі ў Расіі ў 1721—37. Выкладаліся: чытанне, граматыка, рэлігія, у некаторых школах — таксама арыфметыка, лац., грэч., славянская, стараж.-яўрэйская мовы. З 1737 паступова пераўтвораны ў духоўныя семінарыі.

*Г.В.Сегянюк.*

**АРХІ́Т** (ад грэч. orchis яечка), запаленне *яечка*. Адзначаецца ў чалавека і млекакормячых, часта спалучаецца з *эпідыдымітамі*. Неспецыфічныя А. выклікаюцца бактэрыямі, вірусамі, часцей маюць другаснае паходжанне, спецыфічныя — узбуджальнікі туберкулёзу, бруцэлёзу, сіфілісу, актынамікозу. Ганарэйныя, трыхаманозныя, хламідыёзныя, мікаплазмавыя А. перадаюцца палавым шляхам. Прычынай А. могуць быць перакруты яечка і гідатыдаў, яго траўматычныя пашкоджанні. Пры вострых А. павышаная балючасць пры хадзе, дотыку адзення, змена паходкі. А. могуць прывесці да атрафіі аднаго або абодвух яечак, што тоіць у сабе бясплоддзе і зніжэнне патэнцыі. Лечаць вострыя А. ў стацыянары, хірург. ускрыццём гнайнікоў або выдаленнем яечка. Хранічныя А. трэба дыферэнцыраваць ад злаякасных пухлін. Палавыя здольнасці, як правіла, захоўваюцца.

**«АРХИТЕКТУ́РА И СТРОИ́ТЕЛЬСТВО БЕЛАРУ́СИ»**, навукова-тэхнічны часопіс. Выходзіць з 1970 у Мінску на рус. мове раз у 2 месяцы; да 1991 наз. «Строительство и архитектура Белоруссии». Публікуе матэрыялы па архітэктуры, праектаванні, эканоміцы, арг-цыі і тэхналогіі буд-ва, буд. матэрыялах, арх. спадчыне.

**АРХІТРА́Ў** (ад *архі...* + лац. trabs бэлька), бэлька, якая абапіраецца на капітэлі калон і пілястраў, слупы, інш. апоры і нясе *фрыз* і *карніз*; ніжняя частка *антаблемента*.

Узнік з фарміраваннем стоечна-бэлечнай канструкцыі ў архітэктуры Стараж. Грэцыі; выконваў ролю канструкцыйнага нясучага элемента, на які клалі бэлькі перакрыцця. З развіццём ант. ордэрнай сістэмы з'явіліся варыянты А.: у выглядзе гладкай бэлькі ў дарычным і тасканскім, з 3 невял. гарыз. ўступамі (фасцыямі) у іанічным і карынфскім ордэрах. Найб. пашыраны ў архітэктуры класіцызму.

**АРХІТЭКТО́НІКА** (ад грэч. architektonikē будаўнічае мастацтва), мастацкае выяўленне заканамернасцяў будовы, уласцівых канструкцыйнай сістэме будынка, круглай скульптуры, аб'ёмным творам дэкар. мастацтва; у шырокім сэнсе — будова маст. твора (карціны, сімфоніі, кінафільма, рамана і г.д.), якая абумоўлівае суадносіны яго гал. і другарадных элементаў.

У архітэктуры выяўляецца ў суразмернасці, супадпарадкаванасці, прапарцыянальнасці, маштабнасці, рытмічнасці ўсіх элементаў будынкаў і збудаванняў. Садзейнічае цэласнаму эстэт. ўспрыманню арх. твора, у якім арганічна спалучаюцца яго лагічная функцыян.-канструкцыйная аснова, кампазіцыя, дэкор і інш. Кожны арх. стыль надае своеасаблівасць А. пэўнай эпохі. У ант. архітэктуры Стараж. Грэцыі і Рыма найб. дасканалая і гарманічная была А. класічнага арх. *ордэра*, заснаванага на маст. перапрацоўцы стоечна-бэлечнай сістэмы. У готыцы і ў эпоху Адраджэння маст. выразнасць будынкаў грунтавалася на А. арачных канструкцый. У архітэктуры барока А. найчасцей грунтавалася на апасродкаваным выяўленні з дапамогай ордэрных элементаў дэкору дынамікі канструкцый. У эпоху класіцызму А. базіравалася на выразных гарманічных прапорцыях, сіметрыі, ураўнаважанасці аб'ёмаў, выкарыстанні класічных ордэрных кампазіцый. Дасканаласць А. нар. драўлянага дойлідства ў непарушным адзінстве шматвяковага развіцця яе арх. формы і функцыян.-канструкцыйнага зместу.

У літаратуры — агульная будова літ. твора, якая выяўляецца ў спалучэнні яго частак і элементаў, у сродках гарманічнага афармлення і структурнай арганізацыі твора як адзінага маст. цэлага. Своеасаблівасць А. залежыць ад ідэйнай задумы твора, жанравых законаў, індывід. аўтарскага стылю. Падзел твора на часткі і раздзелы мае творчы, змяс-

А.Архіпенка. Торс. Мармур. 1914.

А.Архіпенка. Медрана. 1914.

Архітраў.

тоўны характар, а паслядоўнасць іх чаргавання, узаемасувязі вызначаюцца яго ўнутр. будовай — *кампазіцыяй*. Некаторыя вял. эпічныя творы складаюцца з «кніг» («Сустрэнемся на барыкадах» П.Пестрака — з 2, «Мінскі напрамак» І.Мележа — з 3). Твор з некалькіх самастойных кніг, аб'яднаных сюжэтнай пераемнасцю, набывае форму дылогіі, трылогіі і г.д. У паэзіі А. выяўляецца ў сістэме строф, якія ў буйным творы злучаюцца ў раздзелы ці часткі. Цвёрдая страфа (санет, трыялет, рандо і інш.) складае закончаны твор. У драматургіі змест падзяляецца на дзеі (акты), апошнія — на карціны (з'явы). *А.М.Кулагін, А.М.Пяткевіч.*

**АРХІТЭКТУ́РА** (лац. architectura ад грэч. architektōn будаўнік), дойлідства, мастацтва праектавання і будаўніцтва будынкаў, збудаванняў і іх комплексаў, а таксама сістэма будынкаў і збудаванняў, якія фарміруюць прасторавае асяроддзе для жыцця і дзейнасці людзей. А. адначасова з'яўляецца і галіной матэрыяльнай культуры і маст. творчасці. Ствараецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі і магчымасцямі грамадства, якое вызначае функцыян. прызначэнне і маст. лад А. Паводле функцыян. прызначэння падзяляецца на жылую А. (гл. *Жыллё*), *прамысловую архітэктуру*, А. грамадскіх будынкаў і збудаванняў (гл. *Грамадскія будынкі*), садова-паркавую (гл. *Садова-паркавае мастацтва*). У асобныя галіны вылучаюць планіроўку і забудову гар. і сельскіх населеных месцаў (гл. *Горадабудаўніцтва, Сельская архітэктура*). Пры стварэнні матэрыяльнага асяроддзя жыцця і дзейнасці людзей А. зыходзіць з патрабаванняў карыснасці, трываласці і прыгажосці. Адзін з асн. яе крытэрыяў — мэтазгоднасць. А. мае спецыфічныя сродкі выяўлення ідэйна-маст. зместу, гал. з іх — фарміраванне прасторы і *архітэктоніка*. Для гарманізацыі прасторавых формаў выкарыстоўваюць кампазіцыйна-вобразныя прыёмы і сродкі: *сіметрыю і асіметрыю, кантраст і нюанс, рытм, прапорцыі*, маштабнасць, вылучэнне гал. ў кампазіцыі, суразмернасць частак і цэлага і г.д. Маст. выразнасць твораў А. павышаецца падборам фактуры, колеру, дэкар. элементаў, выяўленнем формы з дапамогай святлаценю і інш. Асобны будынак, нават дасканалай маст. формы, успрымаецца сам па сабе, а разам з інш. аб'ектамі і ландшафтам стварае пэўную арх.-прасторавую сістэму, вышэйшай ступенню якой з'яўляецца арх. *ансамбль*.Найбольшы маст. эфект дасягаецца ў выніку сінтэзу А. з інш. відамі мастацтва (жывапіс, скульптура, дэкар.-прыкладное мастацтва, маст. канструяванне; гл. *Сінтэз мастацтваў*). Сукупнасць функцыян., канструкцыйных і маст. рысаў, уласцівых А. пэўнага народа ў вызначаны гіст. перыяд, складае яе *стыль*. Нац. характар А. выяўляецца ў яе асаблівасцях пэўнага народа або рэгіёна і звязаны з іх гіст. развіццём, эканомікай, культурай, этнічнымі і маст. традыцыямі. Найб. яскравы нац. характар маюць помнікі *народнага дойлідства*. Мясц. традыцыі А. часцей сінтэзуюцца з традыцыямі, агульнымі для многіх краін і народаў. У гэтым выяўляецца ўзаемаўплыў і ўзаемадзеянне мастацтва розных народаў, кожны з якіх робіць свой уклад ў сусветную А.

А. зарадзілася, калі чалавек пачаў сам будаваць жыллё. Найб. раннія жылыя збудаванні на тэр. Беларусі адносяцца да часоў палеаліту (стаянкі каля вёсак Бердыж Чачэрскага і Юравічы Калінкавіцкага р-наў Го-



Да арт. **Архітэктоніка.** Нервюрнае скляпенне інтэр'ера сабора ў г. Эксетэр (Вялікабрытанія). 1300—99.



Да арт. **Архітэктура.** Спаса-Ефрасіннеўская царква ў Полацку. 1152—61 (уверсе); Дзмітрыеўскі сабор ва Уладзіміры. 1194—97.

Да арт. **Архітэктура.** Храм Геры ў Пестуме. Італія. 5 ст. да н.э.

мельскай вобл.). Пазней з'явіліся селішчы з наземнымі жытламі. Ад часоў бронз. і жал. вякоў у Англіі, Францыі, Арменіі і інш. краінах захаваліся культавыя *мегалітычныя збудаванні* — дальмены, менгіры, кромлехі (сусветна вядомы кромлех у Стоўнхенджы, Вялікабрытанія) і *абарончыя збудаванні*. У рабаўладальніцкіх дзяржавах, дзе ў руках маёмных класаў канцэнтраваліся сродкі і бясплатная рабочая сіла, былі дасягненні навукі і тэхнікі, ствараліся буйныя ірыгацыйныя сістэмы, абарончыя і культавыя забудаванні, манум. палацы і храмы (піраміды ў Гізе, храмы ў Луксоры і Карнаку ў Егіпце, зікураты *Асірыі* і *Вавілоніі*, *Вялікая Кітайская сцяна*, пячорныя храмы і ступы ў Індыі, храмы і палацы *інкаў* і *ацтэкаў*). У эпоху росквіту *эгейскага мастацтва* і гарадоў-дзяржаў (полісаў) Стараж. Грэцыі развівалася сістэма рэгулярнай планіроўкі гарадоў, узніклі разнастайныя тыпы жылых, культавых і грамадскіх будынкаў, грамадска-рэліг. цэнтры — акропалі (*Афінскі акропаль*), склалася сістэма арх. *ордэра*. Прасякнутая гуманіст. духам А. Стараж. Грэцыі значна паўплывала на далейшае развіццё сусветнага дойлідства. У Стараж. Рыме вял. значэнне набылі збудаванні, якія сведчылі аб магутнасці дзяржавы (*форумы, амфітэатры, тэрмы, базілікі, палацы, аркі трыумфальныя*), з'явіліся скляпеністыя перакрыцці, новыя буд. матэрыялы (*Рымскі Калізей, Рымскі Пантэон*). У эпоху сярэднявечча асн. тыпамі былі культавыя збудаванні (хрысц. цэрквы і манастыры ў Еўропе, *мячэці* і *медрэсэ, маўзалеі* ва ўсх. краінах), а таксама крапасныя і абарончыя *замкі, крамлі*. У Візантыі створаны буйныя купальныя збудаванні (*Канстанцінопальскі Сафійскі сабор*). Візантыйская А. зрабіла вял. ўплыў на дойлідства Балгарыі, Сербіі, Македоніі, Грузіі, Арменіі і Стараж. Русі. На землях Кіеўскай Русі ў 10—12 ст. будаваліся гарады, абарончыя ўмацаванні з магутнымі валамі і вежамі (Залатыя вароты ў Кіеве), храмы (*Кіеўскі Сафійскі сабор, Наўгародскі Сафійскі сабор Уладзімірскі Дзмітрыеўскі сабор*), на бел. землях — *Полацкі Сафійскі сабор, Полацкая Спаса-Ефрасіннеўская царква, Віцебская Благавешчанская царква*), княжацкія палацы. У 12—14 ст. на землях б. Стараж. Русі склаліся школы дойлідства: кіеўская, чарнігаўская, уладзіміра-суздальская, пскоўская, наўгародская, гродзенская, полацкая (гл. асобныя арт.). У 14—16 ст. фарміруецца руская, украінская, беларуская А. У 17—18 ст. высокага ўзроўню дасягнула рус., бел. і ўкр. *драўлянае дойлідства* (*Кіжы, Новамаскоўскі Троіцкі сабор, Рубельская Міхайлаўская царква*). Значны ўклад у развіццё А. сярэднявечча зрабілі народы араб. Усходу і Сярэдняй Азіі (гл. ў арт. *Арабская культура*), Паўд.-Усх. Азіі (храмавы комплекс *Ангкор* у Камбоджы, маўзалей *Тадж-Махал* у Агры, Індыя). У Зах. і Цэнтр. Еўропе ў канцы 10 ст. склаўся *раманскі стыль* — манастырскія комплексы з замкнутымі дварамі-*клуатрамі*, масіўныя храмы базілікальнага тыпу з некалькімі манументальнымі вежамі (саборы ў Мілане, Вормсе, Ілі і інш.). У 12 ст. ў Францыі, а потым у краінах Зах. і Цэнтр. Еўропы пашырылася А. *гатыкі* са своеасаблівай канструкцыйнай сістэмай — нервюрнымі скляпеннямі, стральчатымі аркамі, аркбутанамі і г.д. (саборы ў Парыжы, Рэймсе, Ам'ене, Шартры ў Францыі, Кёльне, Марбургу ў Германіі, у Празе, Кракаве і інш.).

Важны этап гісторыі А. ў краінах Зах. і Цэнтр. Еўропы звязаны з эпохай *Адраджэння*, калі пашырылася буд-ва свецкіх будынкаў, ансамбляў, гарадскіх цэнтраў. На змену ананімнаму рамесніку-дойліду прыйшоў адукаваны спецыяліст-архітэктар, які ў сваіх праектах звяртаецца да ант. спадчыны і абапіраецца на дасягненні сучаснай яму культуры (Ф.Брунелескі, Д.Брамантэ, Мікелоца; тэорыю А. развівалі Л.Б.Альберці, Віньёла, А.Паладыо і інш.). На Беларусі стыль эпохі Адраджэння выявіўся ў культавых (*Заслаўская Спаса-Праабражэнская царква*) і замкава-палацавых (*Мірскі замкава-паркавы комплекс*, ратуша і замкавая брама ў Нясвіжы) пабудовах. У канцы 16 ст. ўзнік стыль *барока* са складанай сістэмай аб'ёму і прасторы, пластычнасцю і сакавітай дэкаратыўнасцю. Ён стаў пануючым у Італіі (арх. Л.Берніні, Ф.Бараміні), Германіі, Аўстрыі, Чэхіі, Іспаніі, Партугаліі, пашырыўся ў Расіі, а ў краінах Лацінскай Амерыкі набыў нац. маст. ўвасабленне. Першы помнік барока на Беларусі — *Нясвіжскі касцёл езуітаў*. Маст. сістэма позняга бел. барока мае назву *віленскае барока*. У 2-й пал. 17 ст. ў Францыі пачала складвацца А. *класіцызму*, якая была гал. кірункам і ў 18 ст. пасля каротказасовай успышкі дэкар. і вычварнага стылю *ракако*. Сярод франц. архітэктараў класіцызму вылучаліся Л.Лево, Ж.Ардуэн-Мансар, А.Ленотр, К.Перо, Ж.А.Габрыэль, К.Н.Леду. У Францыі класіцызм перыяду напалеонаўскай імперыі прый-

Да арт. **Архітэктура.** Сабор Нотр-Дам у Шартры (Францыя). 1194—1260.

Да арт. **Архітэктура.** Сабор у Ілі (Вялікабрытанія). 12 ст. (уверсе); палацца Ручэлаі ў Фларэнцыі (арх. Л.Б.Альберці і Б.Раселіна). 1446—51.

Да арт. **Архітэктура.** Палац Верхні Бельведэр у Вене. Арх. Л.Гільдэбрант. 1722.

шоў да халоднай параднасці *ампіру*. У Расіі ён адцясніў барока і праз абавязковыя «ўзорныя праекты» пашырыўся на звычайную забудову гарадоў. Росквіт рус. класіцызму на пач. 19 ст. адзначаны стварэннем манум. ансамбляў у Пецярбургу, Маскве і правінцыяльных гарадах. Яго прадстаўнікі — В.Бажэнаў, М.Казакоў, І.Староў, Дж.Кварэнгі, А.Захараў, А.Вараніхін, Ж.Тама дэ Тамон, К.Росі, В.Бавэ, Дж.Жылярдзі, А.Грыгор'еў. На Беларусі канца 18 — 1-й пал. 19 ст. ў ліку помнікаў сталага класіцызму ў жыллёвай грамадз. і культавай А. Гомельскі, Сноўскі (Нясвіжскі р-н), Жыліцкі (Кіраўскі р-н), Радзівілімонтаўскі (в. Чырвоная Зорка Клецкага р-на) палацы, *Магілёўскі Іосіфаўскі сабор, Гомельскі Петрапаўлаўскі сабор, Слаўгарадская царква Раства Багародзіцы*. У сярэдзіне 19 ст. класіцызм прыйшоў у заняпад. Пачалі ўзнікаць новыя тыпы збудаванняў: заводскія цэхі, шматпавярховыя фабрычныя будынкі, вакзалы, універсальныя магазіны, выставачныя павільёны, *даходныя дамы*; будынкі з металу і шкла («Хрустальны палац» у Лондане), вышынныя інж.-тэхн. збудаванні з метал. каркасам (*Эйфелева вежа* ў Парыжы). Група архітэктараў т.зв. чыкагскай школы ў ЗША стварыла спецыфічную форму вышыннага канторскага будынка — *небаскроб*. Аднак наватарскія канструкцыі часта губляліся ў дэкар. формах, якія ўзнаўлялі стылі розных эпох (гл. *Эклектызм*). У А. Беларусі канца 19 — пач. 20 ст. ўпор рабіўся на вонкавую дэкаратыўнасць фасадаў, развіваліся рэтраспектыўныя плыні: *неакласіцызм* (будынкі духоўнага ведамства і т-ва с.-г. страхавання ў Мінску, рэальнага вучылішча ў Гродне); *неараманскі стыль* (касцёл Сымона і Алены ў Мінску, касцёл у в. Воўчкавічы Мінскага р-на); *несапраўдная готыка*; *неарускі стыль* (Пазямельна-сялянскі банк у Віцебску, капліца ў в. Лясная Слаўгарадскага р-на Магілёўскай вобл.). Супярэчнасць паміж традыц. А. і новай тэхнікай спрабавалі вырашыць архітэктары стылю *мадэрн*, які ўзнік у 1890-я г. Выкарыстоўваючы новыя буд. і маст. магчымасці, яны аддавалі перавагу пластычнай форме, якая набывала жывапісна-дэкар. трактоўку (А.Гаўдзі ў Іспаніі, У.Макінтош у Вялікабрытаніі, В.Арта ў Бельгіі, Й.Ольбрых, Й.Гофман у Аўстрыі, Ф.Шэхтэль у Расіі). На пач. 20 ст. шэраг архітэктараў спалучалі тэхн. дасягненні з нац. традыцыямі і класічнымі прынцыпамі кампазіцыі (А.Перэ ў Францыі, О.Вагнер і А.Лоз у Аўстрыі, П.Берэнс у Германіі, Х.П.Берлаге ў Нідэрландах). У А. складваецца *рацыяналізм*, гал. прынцып якога — максімальная мэтазгоднасць і дакладная адпаведнасць будынка яго прызначэнню. Рацыяналісты (Ле Карбюзье ў Францыі, прадстаўнікі арх. аб'яднання *«Баўгаўз»* у Германіі) шукалі выразнасці ў лаканізме формаў і іх кантрастах. У 1930-я г. рацыяналізм, пашыраны ў А. ўсіх развітых краінах, атрымаў назву *функцыяналізм*. Імкненню функцыяналістаў да універсальнасці формаў процілстаўлялася т.зв. *арганічная архітэктура*, заснавальнікам якой быў Ф.Л.Райт. У пасляваенны час своеасаблівасцю нац. школ вылучаліся Фінляндыя (А.Аалта), Японія (К.Танге), Бразілія (О.Німеер). У ЗША арх. Л.Міс ван дэр Роэ стварыў канцэпцыю «універсальнай» А., заснаванай на рытмічнай яснасці, прастаце геам. формаў і вял. унутраных прасторах. У процілегласць ёй развіўся кірунак *бруталізму*, які спалучаў функцыянальнасць пабудоў з наўмыснай масіўнасцю і грубай фактурай аголеных паверхняў (Л.Кан і інш. ў ЗША). Усё большыя магчымасці буд. тэхнікі, якія дазваляюць ствараць складаныя прасторавыя формы зборных жалезабетонных абалонак і вантавых пакрыццяў, набылі маст. асэнсаванне ў збудаваннях П.Л.Нерві ў Італіі, Ф.Кандэлы ў Мексіцы і інш. У 1970—80-я г. ў ЗША і Зах. Еўропе пашырыўся *постмадэрнізм*, які абвясціў вяртанне да рознастылёвых гіст. арх. формаў мінулых эпох (П'яцца д'Італія ў Нью-Арлеане).

У А. былога СССР таксама прасочваюцца пэўныя стылявыя змены. Рысы А. 1920 — пач. 30-х г. выявіліся ў пошуках новых формаў маст. выразнасці і рацыянальнага выкарыстання збудаванняў — лаканічнасць і прастата арх.-маст. вырашэння фасадаў (будынак Дзяржпрома ў Харкаве, *Дом урада Рэспублікі Беларусь* і інш.). Узніклі новыя тыпы грамадскіх будынкаў — палацы культуры, рабочыя клубы, фабрыкі-кухні, т.зв. дамы-камуны, у праектаванні якіх удзельнічалі групоўкі «канструктывістаў» (браты Весніны, М.Гінзбург, І.Леанідаў), «функцыяналістаў» (К.Мельнікаў, М.Ладоўскі) і інш. Дойліды старэйшага пакалення імкнуліся захаваць класічныя арх. традыцыі (А.Шчусеў, І.Жалтоўскі, І.Фамін). З пачаткам пяцігодак сав. А. перайшла да масавага стварэння буйных прамысл. комплексаў, жылых масіваў і цэлых гарадоў. З 2-й пал. 1930-х г. у А. грамадскіх будынкаў узніклі тэндэнцыі да захаплення параднасцю, заснаваныя на выкарыстанні класічнай спадчыны, што прывяло да часовага адыходу ад наватарскіх прыёмаў. Дасягненнем гэтага перыяду была рэалізацыя шырокіх горадабудаўнічых ідэй (ген. планы рэканструкцыі Масквы, Ленінграда, Мінска, Гомеля, Віцебска і інш.). У пасляваенны час паралельна з вырашэннем грандыёзных задач па аднаўленні і рэканструкцыі разбураных гарадоў, ствараліся новыя ансамблі гарадскіх цэнтраў. Удасканальваліся віды і тыпы збудаванняў, шырока ўкараняўся метад тыпавога праектавання. Разам з тым назіраўся і зварот да класічнай арх. спадчыны, імкненне да трыумфальнасці, што адбівалася на вырашэнні функцыян., тэхн. і эканам. аспектаў і тэмпе буд-ва. З укараненнем індустр. метадаў буд-ва пашыралася колькасць тыпавых праектаў жылых дамоў з павялічаным наборам тыпаў кватэр. Імкненне да утылітарнасці і эканоміі прывяло да мана-

Да арт. **Архітэктура.** Мікалаеўская царква ў в. Кажан-Гарадок Лунінецкага раёна Брэсцкай вобл. 1818.

Да арт. **Архітэктура.** Царква Саграда Фамілія ў Барселоне. Арх. А. Гаўдзі. 1884—1926.



Да арт. **Архітэктура.** Алімпійскі спартыўны комплекс у Токіо. Арх. К. Тангэ. 1960—64.



Да арт. **Архітэктура.** Капэла Нотр-Дам-дзю-О у Раншане (Францыя). Арх. Ле Карбюзье. 1950—53.

тоннай аднастайнасці А. З 1970-х г. пачынаюць стварацца новыя жылыя раёны, дзе ў буд-ве выкарыстаны больш эстэтычна выразныя формы і планіровачныя прынцыпы, у т.л. *Зялёны Луг* і *Усход* у Мінску. Перадавыя тэхн. прыёмы давалі магчымасць стварыць грамадскія збудаванні са свабодным аб'ёмна-планіровачным вырашэннем (Палац з'ездаў у Маскве, палацы мастацтваў і культуры ў Алматы, Ташкенце, Ерэване, Кіеве, Рэсп. інфармацыйна-культурны цэнтр, павільён міжнародных выставак і Палац спорту ў Мінску, аэравакзал ў Брэсце і інш.). Важную ролю ў фарміраванні горадабуд. структур адыгрываюць *мемарыяльныя збудаванні* і комплексы, якія арганічна ўваходзяць у ансамблі населеных пунктаў і ландшафтаў. Гл. таксама раздзелы «Архітэктура» ў арт. пра Беларусь і інш. краіны і вял. гарады.

*Літ.:* Всеобщая история архитектуры. Т. 1—12. 2 изд. М., 1970—75; Витрувий. Десять книг об архитектуре: Пер. с лат. М., 1936; Буров А.К. Об архитектуре. М., 1960; Виолле ле Дюк. Беседы об архитектуре: Пер. с фр. Т. 1—2. М., 1937—38; Гропиус В. Границы архитектуры: Пер. с англ. М., 1971; Мастера архитектуры об архитектуре. М., 1972; Бэнэм Р. Взгляд на современную архитектуру: Эпоха мастеров: Пер. с англ. М., 1980; Гидион З. Пространство, время, архитектура: Пер. с нем. 3 изд. М., 1984; Ле Корбюзье. Архитектура XX в.: Пер. с фр. 2 изд. М., 1977; Нимейер О. Архитектура и общество: Пер. с португ., англ. и фр. М., 1975; Райт Ф.Л. Будущее архитектуры: Пер. с англ. М., 1960; Архітэктура Беларусі: Энцыкл. давед. Мн., 1993; Encyclopeadia of modern architecture. London, 1963; History of world architecture. Vol. 1—14. New York, 1972—80; Krajewski K. Mala encyklopedia architektury i wnętrz. Wrocław etc., 1974; Broniewski T. Historia architektury dla wszystkich. 2 wyd. Wrocław etc., 1980; Benevolo L. Histoire de l'architecture moderne. [Vol.] 1—2. Paris, 1979—80; Pevsner N., Fleming J., Honour H., Encyklopedia architektury. Warszawa, 1992.

*А.А.Воінаў.*

**АРХІТЭКТУ́РА БЕЛАРУ́СІ»**, аднатомны энцыклапедычны даведнік. Падрыхтаваны і выдадзены выд-вам *«Беларуская Энцыклапедыя»* ў 1993. Уключае больш за 1200 артыкулаў пра помнікі стараж. і сучаснага дойлідства, мемарыяльныя збудаванні, адметныя дасягненні горадабудаўнічага мастацтва, архітэктуру жылых і грамадскіх будынкаў, прамысл. і сельскую, палацавую і сядзібна-паркавую, замкавае і абарончае буд-ва, культавае дойлідства, населеныя пункты Беларусі; біягр. артыкулы; слоўнік арх. тэрмінаў. Артыкулы ілюстраваны здымкамі, чарцяжамі, малюнкамі, картамі.

*В.К.Шчэрбін.*

**АРХІТЭКТУ́РА МАЛЫ́Х ФО́РМАЎ**, малыя архітэктурныя формы, розныя па характары і прызначэнні тыпы збудаванняў ці інш. аб'ектаў, якія дапаўняюць і дэталізуюць архітэктурна-будаўнічую ці садова-паркавую кампазіцыю і з'яўляюцца элементам афармлення і добраўпарадкавання (ме-

Да арт. Архітэктура. П'яцца д'Італія ў Нью-Арлеане. Фантан. Арх. Ч. Мур. 1976.

Да арт. Архітэктура. Галоўны корпус архітэктурна-будаўнічага факультэта БПА у Мінску. Арх. І.Есьман, В.Анікін. 1982.

Энцыклапедыя «Архітэктура Беларусі». Вокладка.

Да арт. Архітэктура. Павільён міжнародных выставак у Мінску. Арх. Л.Маскалевіч і інш. 1989.

марыяльныя стэлы, абеліскі, надмагіллі, фантаны, каскады, басейны, паркавыя павільёны, пандусы, балюстрады, агароджы, пергалы, вазы, дэкар. і прыдарожная скульптура і інш.). Ім належыць важная роля ў фарміраванні аблічча населеных пунктаў, трансп. магістраляў, зон адпачынку.

У адрозненне ад частак будынкаў і арх. дэталяў творы А.м.ф. адносна самастойныя. Ім належыць важнае месца ў кампазіцыі садова-паркавых ансамбляў, добраўпарадкаванні жылых груп, тэр. школьных і дашкольных устаноў, дзіцячых пляцовак і гаражоў; яны — неад'емная частка сучасных населеных месцаў (электрасвяцільні, кіёскі, павільёны, гандл. аўтаматы, тэлефонныя будкі, стэнды для афіш і рэклама).

**АРХІТЭКТУ́РНАЯ АКУ́СТЫКА**, гл. *Акустыка архітэктурная*.

**АРХІТЭКТУ́РНЫЯ МУЗЕ́І**. Вывучаюць, збіраюць, экспануюць, прапагандуюць і папулярызуюць помнікі нар. дойлідства, прадметы побыту, творы дэкар.-прыкладнога мастацтва і інш., якія характарызуюць матэрыяльную і духоўную культуру народаў і краін.

А.м. часта маюць форму т.зв. паркаў-музеяў або музеяў пад адкрытым небам, дзе сабраны звезеныя з розных рэгіёнаў помнікі нар. драўлянага дойлідства [навукова-даследчы А.м. імя А.В.Шчусева ў Маскве (1964), «Скансен» у Стакгольме, Латвійскі этнагр. музей пад адкрытым небам, Музей нар. побыту Літвы, Дзярж. музей нар. архітэктуры Украіны, Львоўскі музей нар. дойлідства і побыту, Музей нар. дойлідства і побыту Грузіі і інш.]. На Беларусі з 1970 дзейнічае *Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту*.

**АРХІТЭКТУ́РНЫЯ ЧАСО́ПІСЫ**. Змяшчаюць матэрыялы па архітэктуры, будаўніцтве, абсталяванні будынкаў, добраўпарадкаванні населенай тэрыторыі. На Беларусі з 1970 выдаецца час. «*Архитектура и строительство Беларуси*» (4 нумары ў год). Матэрыялы па архітэктуры публікуюцца ў час. «Весці АН Беларусі» (серыя гуманітарных навук), «Мастацтва» і інш. У Расіі першы А.ч. «Архитектурный вестник» выдаваўся ў 1859—61 у Пецярбургу, у 1872—1917 — час. «Зодчий» Пецярб. т-ва архітэктараў з дадаткам «Неделя строителя». У СССР выдавалася больш як 20 А.ч., у т.л. «Современная архитектура» (1926—30), «Архитектура СССР» (1933—91), «Архитектура и строительство Москвы» і інш.

Найб. вядомыя замежныя А.ч., якія шырока асвятляюць пытанні сучаснай архітэктуры, «Journal of the Royal institute of British architects» («Часопіс Каралеўскага ін-та Брыт. архітэктараў», Лондан, з 1893); «Baumeister» («Будаўнік», Мюнхен, з 1902); «Werk» («Праца», Цюрых, Швейцарыя, з 1914); «L'architecture d'aujourd'hui» («Сучасная архітэктура», Парыж, з 1930), «L'architecture française» («Французская архітэктура», Парыж, з 1940) і інш.

**АРХІТЭУ́ЦЫС** (Architeuthis), род гіганцкіх кальмараў атр. дзесяціногіх галаваногіх малюскаў. Каля 10 відаў. Узніклі прыкладна ў познім мезазоі, росквіту дасягнулі ў неагене. Самыя вял. беспазваночныя жывёлы. Найб. вядомы А. — «даўгарукі спрут».

Даўж. са шчупальцамі дасягае 19 м, маса да 1 т і болей. Жывуць пераважна ў трапічных морах і акіянах. Цела верацёнападобнае. На галаве 8 «рук» і 2 шчупальцы. Яйцы адкладваюць на дно ці ў тоўшчу вады. Драпежнікі. Аб'екты промыслу. Мяса смачнае. Выкарыстоўваюцца таксама ў фармацэўтычнай прам-сці.

**АРХІ́Ў** (лац. archivum), 1) установа або яе аддзел, што захоўвае дакументы і арганізуе іх выкарыстанне. 2) Сукупнасць дакументаў, якія з'явіліся ў выніку дзейнасці ўстаноў, прадпрыемстваў і прыватных асоб. Як збор крыніц А. служыць для навук. даследаванняў, практ. патрэб гаспадаркі і дзярж. кіравання.

Існуюць з глыбокай старажытнасці, іх з'яўленне падрыхтавана вынаходствам пісьменства. У Месапатаміі і М.Азіі археолагі раскапалі ў палацах правіцеляў, іх намеснікаў, дамах прыватных асоб і храмах архівасховішчы адм.-гасп. дакументаў, напісаных на гліняных таблічках. Знойдзены дыпламат. сховішчы стараж.-егіп. фараонаў. Уласна А., прыстасаваныя для захоўвання актаў, былі ў Стараж. Грэцыі і Рыме. У 12—13 ст. у Францыі, Іспаніі, Англіі і інш. краінах узніклі т.зв. каронныя А. пры дварах правіцеляў. Значную ч. гіст. крыніц у гэты час захоўвалі царк. ўстановы. З 16 ст. многія дзярж. ўстановы імкнуліся мець уласныя А. У выніку каланізацыі еўрапейцамі зямель і інш. кантынентаў узніклі буйныя каланіяльныя А. (напр., Гал. А. Індый у Іспаніі). З 19 ст. матэрыялы многіх А. сталі даступныя даследчыкам, пачало складвацца міжнар. архіўнае супрацоўніцтва. У 1950 на 1-м Міжнар. кангрэсе архіваў зацверджаны статут Міжнар. савета архіваў. З ім супрацоўнічаюць архівісты амаль 120 краін (1994), выдаецца міжнар. час. «Archivum». Найб. архіўныя ўстановы свету: франц. Нац. А. (Archives Nationales; у Парыжы, з 1794), у Англіі Дзярж. публічны А. (Public Record Office; у Лондане, з 1838), у ЗША Нац. А. (Nationales Archives; у Вашынгтоне, з 1934); у ФРГ Федэральны А. (Bundesarchiv; у г. Кобленц, з 1952); у Польшчы А. новых актаў (Archiwum Akt Nowych; з 1930) і Гал. А. стараж. актаў (Archiwum Główne Akt Dawnych; з 1867; абодва ў Варшаве), Дзярж. А. Расійскай Федэрацыі (б. Цэнтр. дзярж. А. Кастр. рэвалюцыі, вышэйшых органаў дзярж. улады і органаў дзярж. кіравання СССР, Масква), Рас. дзярж. гіст. А. (б. Цэнтр. дзярж. гіст. А. СССР, С.-Пецярбург) і інш.

Да арт. **Архітэктура малых формаў**. Скульптура ў Алімпійскім парку Сеула. 1988.

Да арт. **Архітэктура малых формаў**. Аркада галоўнага ўвахода стадыёна «Дынама» ў Мінску.

На Беларусі першыя А. ўтвараліся ў княжацкіх замках, манастырах, цэрквах. Пры канцылярыі вял. князёў ВКЛ існаваў А. — *Метрыка Вялікага княства Літоўскага*. Свае А. мелі гаспадарскія і гарадскія адміністрацыі, магнаты (Радзівілы, Сапегі, Хадкевічы), шляхта, некаторыя заможныя мяшчане. З 2-й пал. 19 ст. дакументы ВКЛ зберагаліся ў *Віленскім цэнтральным архіве старажытных актаў* і Віцебскім цэнтральным архіве старажытных актаў. У Мінску з 1872 існаваў А. скасаваных судовых месцаў Мінскай губ. 4.8.1922 створаны Цэнтр. А. Беларусі (заг. З.Х.Жылуновіч), які кіраваў архіўнай справай у БССР. Праведзены Усебеларускія канферэнцыі архіўных работнікаў (Мінск, 1924, 1927), 1-ы з'езд даследчыкаў бел. археалогіі і археаграфіі (Мінск, 1926). У 1938—60 архіўныя ўстановы ўваходзілі ў сістэму НКУС (МУС) БССР. Навукова-

вае і арганізац.-метадычнае кіраўніцтва А. ажыццяўляла Гал. архіўнае ўпраўленне пры СМ БССР, пераўтворанае ў 1992 у Камітэт па архівах і справаводстве. У 1994 прыняты закон «Аб нацыянальным архіўным фондзе і архівах у Рэспубліцы Беларусь». На Беларусі 6 цэнтр. дзярж. А. (1995): Нац. архіў Рэспублікі Беларусь, Нац. гіст. архівы Рэспублікі Беларусь у Мінску і Гродне, Бел. дзярж. А. кінафотафонадакументаў, Бел. дзярж. архіў-музей л-ры і мастацтва, Бел. дзярж. А. навукова-тэхн. дакументацыі. Абласныя А. і іх філіялы захоўваюць дакументы мясц. устаноў, арг-цый, прадпрыемстваў, калгасаў і інш. (гл. адпаведныя арт., напр., *Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці*). Існуюць таксама архівы АН Беларусі, КДБ Рэспублікі Беларусь. Рукапісы і гіст. дакументы захоўваюцца таксама ў бібліятэках, музеях і навук. установах. Буйныя комплексы дакументаў па гісторыі Беларусі знаходзяцца ў А. Польшчы, Расіі, Літвы, Украіны, Германіі, Швецыі, ЗША і інш.

*Літ.:* Архивное дело в БССР (1918—1968): Сб. законодательных и руководящих документов. Мн., 1972; Дакументы па гісторыі

Беларусі, якія зберагаюцца ў цэнтральных дзяржаўных архівах СССР. Мн., 1990.
*А.М.Міхальчанка* (архівы Беларусі).

**«АРХІЎ ГІСТАРЫЧНАЙ КАМІСІІ»** («Archiwum Komisyi Historycznej»), серыйнае выданне дакументальных матэрыялаў 15—19 ст. Выходзіла ў 1878—1949 у Кракаве пад апекаю Гіст. камісіі Польскай АН. Выдадзена 16 тамоў. Пераважаюць матэрыялы крыніцазнаўчага характару, першакрыніцы па гісторыі права, царквы, грамадска-паліт., дыпламат. адносін, агляды бібліятэк і архіваў. Сярод найб. значных публікацый — матэрыялы па гісторыі вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67, дакументы Пастаяннай Рады, інвентары зямельных уладанняў, апісанні рукапісаў і дакументаў у архівах і бібліятэках Рыма, Пецярбурга, Будапешта, «Рэвізія Полацкага ваяводства 1552», матэрыялы па гісторыі праектаў царк. уніі канца 15 — пач. 16 ст. і інш. Дакументы ў асн. на польск. і лац. мовах. *Г.Я.Галенчанка.*

**«АРХІЎ ДО́МУ РАДЗІВІ́ЛАЎ»** («Archiwum domu Radziwiłłów»), зборнік гістарычных дакументаў, што захоўваліся ў канцы 19 ст. ў нясвіжскім архіве *Радзівілаў*. Выдадзены ў 1885 у Кракаве. Складаецца з 3 комплексаў перапіскі за 1571—1633 на лац. і польскай мовах: сямейная і прыватная карэспандэнцыя М.К.Радзівіла Сіроткі; перапіска канцлера ВКЛ, гетмана вял. кароннага Я.Замойскага і канцлера ВКЛ, гетмана вял. літ. Л.Сапегі з Радзівіламі. Зборнік асвятляе ўнутр. і знешнюю палітыку кіруючых колаў ВКЛ, дае звесткі пра Люблінскую унію 1569, Інфлянцкую вайну 1558—82, рокаш Зебжыдоўскага, Брэсцкую унію 1596, рэфармацыю на Беларусі і ў Літве, падрыхтоўку Статута ВКЛ 1588, паўстанне С.Налівайкі 1595—96. Змешчаны «Адманіторыум» (1603) — маральна-павучальнае і гасп.-дзелавое настаўленне спадкаемцам Радзівіла Сіроткі. *Г.Я.Галенчанка.*

**«АРХІЎ ДО́МУ САПЕ́ГАЎ»** («Archiwum domu Sapiehów»), зборнік дакументаў з радавога архіва *Сапегаў* у Красічыне (каля Перамышля) за 1575—1606. Выдадзены ў 1892 у Львове. Змешчана 625 лістоў (на польск. мове), з іх 279 належалі канцлеру ВКЛ Л.Сапегу. Уключаны таксама эпісталярныя помнікі з нясвіжскага архіва Радзівілаў, бібліятэк Варшавы, Кракава, Пецярбурга. Лісты прысвечаны дзярж.-паліт., адм., гасп. і сямейна-бытавым справам. Ёсць звесткі пра адносіны ВКЛ з Маск. дзяржавай, крымскімі татарамі, запарожскімі казакамі, Польшчай, Англіяй, рымскімі папамі, пра Брэсцкую унію 1596, правасл. брацтвы, палемічнае кнігадрукаванне, паўстанне С.Налівайкі 1595—96 і інш. *Г.Я.Галенчанка.*

**«АРХІЎ КНЯЗЁЎ ЛЮБАРТО́ВІЧАЎ-САНГУ́ШКАЎ У СЛАВУ́ЦЕ»** («Archiwum książąt Lubartowiczów Sanguszków w Sławucie»), зборнік дакументаў па гісторыі Беларусі, Украіны і Літвы 13—16 ст. Выдадзены ў 1887—1910 у Львове ў 7 тамах. Дакументы ўзяты з архіва Сангушкаў у мяст. Славута (цяпер Хмельніцкая вобл. Украіны), а таксама з кніг Метрыкі ВКЛ, архіваў Львова, Пецярбурга, Нясвіжа. У зборніку змешчаны дакументы вярх. улады Польшчы і ВКЛ (каралеўскія і велікакняжацкія лісты, інструкцыі, прывілеі, у т.л. на бел. маёнткі, мястэчкі, гарады, замкі, на падатковыя льготы, заснаванне таргоў і кірмашоў, магдэбургскія прывілеі), дакументы пра асобныя соймавыя справы, пасольствы, прыватнаправавыя акты пра сац.-эканам. і сямейна-бытавыя адносіны Сангушкаў, Хадкевічаў, Заслаўскіх, Радзівілаў і інш. Большасць дакументаў на бел. і ўкр. мовах.

**«АРХІЎ ПА ГІСТО́РЫІ ЛІТАРАТУ́РЫ І АСВЕ́ТЫ Ў ПО́ЛЬШЧЫ»** («Archiwum do dziejów literatury i oświaty w Polsce»), серыйнае гісторыка-літаратурнае і крыніцазнаўчае выданне. Выходзіла ў

Архітэуцыс у бойцы з кашалотам.

Кракаве з 1878 да пач. 2-й сусв. вайны. Сярод матэрыялаў (пераважна на польск. мове) дакументы па гісторыі філас. ф-та Кракаўскага ун-та 16 ст., дзе вучылася шмат выхадцаў з Беларусі, бібліягр. агляд І.Кажанеўскага дакументаў па гісторыі Польшчы, Беларусі, Літвы, Украіны (т. 11, 1910), крыніцы па гісторыі Беларусі, у т.л. карэспандэнцыі Сапегаў, Радзівілаў, Хадкевічаў, Пацаў, Тышкевічаў, падарожныя нататкі М.Радзівіла Сіроткі «Падарожжа ў Святую зямлю» (т. 15, 1925). Асвятляецца гісторыя культ. сувязяў Беларусі і Літвы з Польшчай, Італіяй, Рускай і інш. дзяржавамі. *Г.Я.Галенчанка.*

**«АРХІЎ ПАЎДНЁВА-ЗАХО́ДНЯЙ РАСІІ»** («Архив Юго-Западной России, издаваемый временной Комиссией для разбора древних актов...»), зборнік дакументаў і літ. помнікаў Правабярэжнай і Зах. Украіны 14—18 ст. Выдадзены ў Кіеве на рус. мове ў 35 т. (ч. 1—8, 1859—1914). Асн. крыніца выдання — Кіеўскі цэнтр. архіў, дакументы, што паступалі ў Кіеўскую камісію ад прыватных асоб, манастыроў і розных устаноў. Уключаны матэрыялы па гісторыі правасл. царквы 14—18 ст., пратаколы і пастановы шляхецкіх соймікаў за 1569—1726, звесткі пра барацьбу ўкр. казацтва з польск. шляхтай у 1500—1768, акты аб паходжанні шляхецкіх родаў, пра гарады, дакументы аб эканам. і юрыд. становішчы ўкр. сялян 1498—1799, перапісы яўр. насельніцтва і інш.

**«АРХІЎ РУ́СКАЙ РЭВАЛЮ́ЦЫІ»** («Архив русской революции»), зборнік дакументаў па гісторыі рэв. падзей 1917 і грамадз. вайны 1918—22 у Расіі. Выдадзены ў 1922—37 у Берліне ў 22 тамах адным з былых кіраўнікоў рас. канстытуцыйна-дэмакр. партыі І.У.Гесенам. У зборніку надрукаваны ўспаміны, дзённікі (у т.л. старшыні Дзярж. думы М.У.Радзянкі, кіраўніка справамі Часовага ўрада У.Дз.Набокава, данскога атамана ген. П.М.Краснова, вайск. атамана Кубанскага казацкага войска ген.-лейт.. А.П.Філімонава), якія асвятлялі гал. чынам «парадкі і падзеі ўнутры сав. Расіі; арганізацыю, прасоўванне і паражэнне добраахвотніцкіх армій, адносіны да замежных атрадаў і місій, парадкі ў часова аднятых у бальшавікоў абласцях; ролю і побыт рус. эміграцыі ў Еўропе і інш. частках свету; замежнае ўмяшанне, адносіны прадстаўнікоў грамадскай думкі Еўропы і інш. частак свету, адносіны дзярж. дзеячаў». У пач. 1990-х г. «Архіў...» перавыдадзены ў Расіі.
*Публ.:* Архив русской революции. Т. 1—22. М., 1991—93.

**«АРХІЎ ФЮР СЛА́ВІШЭ ФІЛАЛАГІ́»** («Archiw für slavische Philologie», «Архіў славянскай філалогіі»), адзін з першых славістычных часопісаў. Выдаваўся ў 1876—1929 у Берліне на ням. мове. Выйшлі 42 тамы. Заснавальнік і першы рэдактар В.Ягіч. Узняў славістыку да ўзроўню міжнар. навукі. Знаёміў вучоных Зах. Еўропы са слав. культурамі, у т.л. беларускай. Змясціў больш за 20 публікацый па беларусістыцы, у т.л. «Беларускі Codex miscellaneus з бібліятэкі графа Рачынскага ў Познані» (т. 9), «Сляды кувады на Беларусі» Ягіча (т. 9), «Польска-рускія інтэрмедыі XVII ст.» А.Брукнера (т. 13), «Новыя славянскія зборнікі казак» І.Паліўкі (т. 19). На старонках часопіса рэцэнзаваліся амаль усе значныя выданні па бел. фальклоры канца 19 — пач. 20 ст., многія даследаванні па бел. мове. Публікацыі абуджалі цікавасць да культуры бел. народа, спрыялі развіццю даследаванняў па бел. праблематыцы. *У.Л.Сакалоўскі.*

**«АРХІЎ Я́НА ЗАМО́ЙСКАГА»** («Archiwum Jana Zamoyskiego kanclerza i hetmana wielkiego koronnego»), зборнік дакументаў за 1553—84 канцлера Польшчы і вял. кароннага гетмана Я.Замой-

скага. Выдадзены ў 1904—13 у Варшаве ў 3 тамах. Пісьмовыя крыніцы выяўлены выдаўцом В.Сабескім у б-цы ардынацыі Замойскіх. Змешчана перапіска Я.Замойскага з Радзівіламі, Алелькавічамі, Валовічамі, Кішкамі і інш. магнатамі, уплывовымі паліт. і дзярж. дзеячамі ВКЛ. Адлюстраваны ваенна-паліт. і царк.-рэліг. адносіны Польшчы з ВКЛ, Расіяй, Турцыяй, Валахіяй і інш. дзяржавамі, сямейна-бытавыя справы магнатаў. *Г.Я.Галенчанка.*

**АРХІЎНЫЯ КАМІСІІ**, Губернскія вучоныя архіўныя камісіі, губернскія ўстановы па зборы гіст. крыніц у Расіі ў 1884—1918. Створаны па ініцыятыве дырэктара імператарскага Археал. ін-та М.В.Калачова. Дзейнічалі ў 41 губ. Рас. імперыі, на Беларусі — *Віцебская вучоная архіўная камісія.* Паводле «Палажэння» ад 13.4.1884 іх задачай было захаванне дакументаў і стварэнне з іх калекцый для гіст. архіваў. У рабоце камісій удзельнічалі вучоныя (у т.л. У.І.Пічэта), пісьменнікі (М.Горкі, У.Г.Караленка). Камісіі арганізоўвалі б-кі, музеі, збіралі этнагр. матэрыял, праводзілі археал. раскопкі, выдавалі зборнікі «Труды», «Известия», «Действия»; усяго выйшла каля 900 выданняў. Да 1912 А.к. падпарадкоўваліся Археал. ін-ту, пасля — Рускаму гіст. т-ву.

*Літ.:* Самошенко В.Н. История архивного дела в дореволюционной России. М., 1989. С. 135—138; Макарихин В.П. Губернские учёные архивные комиссии России. Нижний Новгород, 1991. *У.Я.Калаткоў.*

**...АРХІЯ** (ад грэч. archē улада, вяршэнства), частка складаных слоў, якая абазначае форму ўлады, кіравання, напр., *алігархія*, манархія.

**АРХО́НА-ЕНІСЕ́ЙСКІЯ НА́ДПІСЫ**, пісьмовыя помнікі цюркамоўных народаў 7—11 ст. Адкрыты ў канцы 17 — пач. 18 ст. ў вярхоўях Енісея і на р. Архон (Манголія). Дэшыфраваны і прачытаны ў канцы 19 ст. Зроблены т.зв. рунічным пісьмом на скалах, камянях, збудаваннях, асобных рэчах (эпітафіі, гіст.-біягр. тэксты, памятныя надпісы), захаваліся тэксты на паперы (юрыд. дакументы, рэліг. тэксты). Вядомы 7 груп А.-е.н.: ленска-прыбайкальская (плямёны курыкан), енісейская (Кыргызскі каганат), мангольская (Усх.-цюркскі каганат), алтайская (Зах.-цюркскі каганат), усх.-туркестанская (Уйгурскі каганат у Манголіі), сярэднеазіяцкая (Уйгурская дзяржава ва Усх. Туркестане) і ўсх.-еўрап. (хазары і печанегі).

**АРХО́НТ**, архант (грэч. archōn), вышэйшая службовая асоба ў стараж.-грэч. полісах. У Афінах гэтая пасада з'явілася ў 11 ст. да н.э., калі замест басілея (цара) тут пачалі правіць пажыццёвыя А. З 8 ст. да н.э. іх улада скарацілася да 10 гадоў, з 7 ст. да н.э. — да 1 года. Кандыдатаў у А. вызначаў *арэапаг.* З 487—486 да н.э. А. выбіралі па жэрабію. З 7 ст. да н.э. ўлада належала 9 А.: эпанім кіраваў выканаўчай уладай, басілей выконваў рэліг. функцыі, палемарх быў военачальнікам, 6 фесмафетаў займаліся суд. справамі. Усе разам складалі калегію А. У 5 ст. да н.э. пасада А. страціла паліт. значэнне.

**АРЦЁМ'ЕЎ** Аляксандр Сяргеевіч (н. 5.7.1928, в. Залацькова Вярэйскага р-на Маскоўскай вобл.), бел. вучоны-эканаміст. Д-р эканам. н. (1979), праф. (1980). Скончыў Маскоўскі ін-т нар. гаспадаркі (1953). У 1953—58 у мін-вах гандлю і дзярж. кантролю БССР. З 1961 у Ін-це эканомікі АН Беларусі, з 1962 у Бел. дзярж. эканам. ун-це. Навук. працы па сац.-эканам. праблемах грамадскага харчавання.

**АРЦЁМ'ЕЎ** Эдуард Мікалаевіч (н. 30.11.1937, г. Новасібірск), рускі кампазітар. Засл. дз. маст. Расіі (1985). Скончыў Маскоўскую кансерваторыю

Да арт. Архона-енісейскія надпісы. Мужчынская надмагільная статуя з рунічным надпісам 10 ст.

(1960). У творчасці шырока выкарыстоўвае серыйную тэхніку, алеаторыку, электронную музыку. Сярод твораў: араторыя «Я забіты пад Ржэвам» на сл. А.Твардоўскага (1963), кантата «Рытуал» (1980), сімфонія «Пілігрымы» (1985); электронная музыка — «Мазаіка Венецыі», «Варыяцыі на адзін тэмбр», «Сем варот у свет Саторый»; вак.-інстр. цыкл

П.С.Арцёмаў. Вазы. 1973.

«Цяпло зямлі»; музыка да кінафільмаў (больш за 80). Дзярж. прэмія Расіі імя братоў Васільевых 1988.

**АРЦЕ́МІЙ**, Троіцкі (? — пач. 1570-х г.), рускі царк. дзеяч і публіцыст, адзін з ідэолагаў *несцяжацеляў.* Прыняўшы манаства, жыў у Пскоўскім Пячэрскім манастыры, потым у заволжскай пустыні, быў ігуменам Троіцкага манастыра. Асуджаў царк. землеўладанне, абраднасць, прывілеі духавенства, прапаведаваў маральнае самаўдасканаленне. За свае погляды адлучаны ад царквы і сасланы ў Салавецкі манастыр (1553). Каля 1554—55 уцёк на Беларусь, жыў у Віцебску, потым у князя Юрыя Алелькі. Перакладаў рэліг. кнігі на царкоўнаслав. мову, выкладаў багаслоўе пры дварэ князя. Захавалася 14 яго пасланняў. Быў знаёмы і вёў палеміку з С.Будным, сярод яго карэспандэнтаў Іван IV, Андрэй Курбскі.

**АРЦЁМ** (сапр. Арцем'еў Аляксандр Радзівонавіч; 1842, с. Столпава Разанскай вобл. — 29.5.1914), рускі акцёр. Скончыў Маскоўскае вучылішча жывапісу, скульптуры і дойлідства (1878). Працаваў настаўнікам маляванння і чыстапісання. З 1880-х г. іграў у аматарскіх спектаклях, з 1888 — у Т-ве мастацтва і л-ры, з 1898 — у Маскоўскім маст. т-ры (МХТ). Найб. поўна талент А. раскрыўся ў п'есах А.Чэхава. Сярод інш. роляў: Пярчыхін («Мяшчане» М.Горкага), Кузаўкін («Нахлебнік» І.Тургенева).

**АРЦЁМАЎ** Павел Якаўлевіч (20.10.1907, С.-Пецярбург — 25.3.1994), бел. вучоны ў галіне механікі. Канд. тэхн. н. (1949), праф. (1971). Скончыў Архангельскі лесатэхн. ін-т (1932), дзе і працаваў. З 1945 у Бел. лесатэхн. ін-це. У 1961—83 у Бел. тэхнал. ін-це. Навук. працы па супраціўленні матэрыялаў, тэорыі трываласці матэрыялаў і канструкцый.

*Тв.:* Таблицы для расчёта на прочность и жёсткость балок и стержней. Мн., 1959; Справочное пособие по сопротивлению материалов. 3 изд. Мн., 1970 (разам з М.М.Рудзіцкім, М.І.Любошыцам).

**АРЦЁМАЎ** Пётр Сяргеевіч (н. 4.7.1941, в. Воткіна Хвастовіцкага р-на Калужскай вобл.), бел. мастак дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1969). Працуе гал. мастаком Барысаўскага хрусталёвага з-да. У галіне маст. шкла распрацаваў асартымент масавых вырабаў з бясколернага хрусталю, каляровага і бясколернага шкла (пітны прыбор «Дзьмухавец», сталовыя сервізы, вазы «Кольцы» і інш.).

*Літ.:* Беларускае мастацкае шкло: [Альбом]. Мн., 1978. *М.М.Яніцкая.*

**АРЦЁМЕНКА** Іван Іванавіч (15.9.1924, с. Гаўрылаўка Новаваранцоўскага р-на Херсонскай вобл. — 27.4.1989), украінскі археолаг. Чл.-кар. АН УССР (1982), д-р гіст. н. (1978). Скончыў Днепрапятроўскі ун-т (1948). З 1948 навук. супрацоўнік Гіст. музея ў Днепрапятроўску. У 1958—72 у Ін-це археалогіі АН

СССР, з 1973 дырэктар. З 1978 у Ін-це археалогіі АН Украіны. Вывучаў гісторыю насельніцтва Усх. Еўропы эпохі неаліту, меднага і бронзавага вякоў. Даследаваў на Беларусі (у Верхнім Падняпроўі) помнікі сярэднедняпроўскай культуры. Дзярж. прэмія Украіны 1980.

*Тв.:* Племена Верхнего и Среднего Поднепровья в эпоху бронзы. М., 1967.

**АРЦЁМЕНКА** Кацярына Гаўрылаўна (н. 10.10.1925, с. Пяскі-Радзькаўскія Бароўскага р-на Харкаўскай вобл.), бел. майстар пляцення мастацкіх вырабаў з саломы. Засл. работнік культуры Беларусі (1980). Заснавальніца промыслу саломапляцення на Магілёўскай ф-цы маст. вырабаў. У творчасці этнагр. і быт. сюжэты («Вяселле», «Беларускія дзяўчаты», «Хлеб-соль Магілёўшчыны», «Тройка», «Конь-агонь»), аніміалістычная тэматыка (цукерніцы, каўшы, хлебніцы і інш. ў выглядзе жывёл і птушак). Лепшыя работы захоўваюцца ў Нац. маст. музеі Беларусі, Нац. музеі гісторыі і культуры Беларусі і інш. *Я.М.Сахута.*

**АРЦЁМЕНКА** Сцяпан Елізаравіч (14.8.1913, с. Малінаўка Іванаўскага р-на Адэскай вобл. — 5.5.1977), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Двойчы Герой Сав. Саюза (люты, май 1945). На фронце са жн. 1941. Камандзір батальёна маёр А. вызначыўся ў 1944 пры вызваленні Укр. і Бел. Палесся, у 1945 у час прарыву абароны ворага на зах. беразе Вісты і пры фарсіраванні р. Одэр.

**АРЦЁМ'ЕЎ** Валянцін Міхайлавіч (н. 15.5.1934, г. Масква), вучоны ў галіне радыёэлектронікі. Чл.-кар. АН Беларусі (1989), д-р тэхн. н. (1974), праф. (1976). Засл. дз. нав. і тэхн. Беларусі (1977). Скончыў Мінскае вышэйшае інж. радыётэхн. вучылішча (1956), дзе і працаваў. З 1987 дырэктар, з 1993 заг. лабараторыі Ін-та прыкладной фізікі АН Беларусі. Навук. працы ў галіне аўтам. кіравання. Распрацаваў тэорыю дынамічных сістэм з выпадкова зменнай структурай.

*Тв.:* Оптимизация динамических систем случайной структуры. М., 1980 (разам з І.Я.Казаковым); Основы автоматического управления. М., 1986; Локационные системы роботов: Справ. пособие. Мн., 1988; Анализ систем случайной структуры. Мн., 1993.

**АРЦЁМ'ЕЎ** Савін, ювелір 17 ст. з Полацка. Працаваў у Сярэбранай палаце Маскоўскага Крамля. З 1661 разам з інш. майстрамі рабіў «усялякія суды і царкоўныя кадзілы».

**АРЦІМО́ВІЧ** Анатоль Яфімавіч (н. 26.9.1940, в. Куранец Вілейскага р-на Мінскай вобл.), бел. скульптар. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1966). Выкладчык АМ Беларусі (з 1966). Асн. творы ў галіне манум. скульптуры: мемарыяльны комплекс «Слава» ў г. Алматы (1975, у сааўт.), рэльеф «Салідарнасць» на фасадзе Бел. цэнтра моды ў Мінску (1979), манум. кампазіцыя «Рагнеда» (1992) у Заслаўі, Дзярж. герб Беларусі на Доме ўрада (1994). Станковыя работы: «Трубач» (1969), «Араты», «Змена» (абедзве 1980). Распрацоўвае гіст. вобразы Ефрасінні Полацкай, Ф.Скарыны, К.Каліноўскага, княгіні Вольгі. Адзін з аўтараў *Кургана славы Савецкай Арміі — вызваліцельніцы Беларусі* і мемарыяльнага комплексу (уваход) *Брэсцкай крэпасці-героя.*

**АРЦІШЭ́ЎСКАЯ** Нэлі Іванаўна (н. 13.9.1934, Гомель), бел. кардыёлаг і рэўматолаг. Д-р мед. н. (1983), праф. (1985). Скончыла Мінскі мед. ін-т (1958), з 1963 у гэтым ін-це. Навук. працы па дыягностыцы і лячэнні рэўматызму, парокаў сэрца ў цяжарных жанчын, рэабілітацыі хворых на розныя формы ішэмічнай хваробы сэрца.

*Тв.:* Практические навыки терапевта: Практич. пособие. Мн., 1993 (у сааўт.); Даведнік напісання дыягназаў асноўных захворванняў унутраных органаў на беларускай, расійскай і лацінскай мовах. Мн., 1994 (у сааўт.).

**АРЦІШЭ́ЎСКІ** Аляксандр Аляксандравіч (н. 30.11.1933, г. Горкі Магілёўскай вобл.), бел. гістолаг і эмбрыёлаг. Д-р мед. н. (1986), праф. (1988). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1958). З 1960 у гэтым ін-це. Навук. працы па эмбрыялогіі, станаўленні эндакрыннай сістэмы ва ўмовах нормы і пры стрэсавых сітуацыях. Увёў у практыку даследавання эмбрыялагічных эндакрынных залоз чалавека гістахім. метады, электронную мікраскапію, колькасны аналіз.

К.Арцёменка. Конь-агонь.

А.Арцімовіч. Рагнеда. 1992. Заслаўе.

*Тв.:* Надпочечные железы. Мн., 1977; Гистофизиология органов кроветворения и иммунитета: Учеб. пособие. Мн., 1988 (разам з Н.А.Жарыкавай, В.Л.Жарыкавай); Даведнік напісання дыягназаў асноўных захворванняў унутраных органаў на беларускай, рускай і лацінскай мовах. Мн., 1994 (у сааўт.).

**АРЦЫБА́ШАЎ** Міхаіл Пятровіч (5.11.1878, Ахтырскі р-н Сумскай вобл., Украіна — 3.3.1927), рускі пісьменнік. Раннія творы («Бунт», «Канакрад», «Смех»; усе 1901) прасякнуты духам лібералізму. У творах перыяду рэвалюцыі 1905—07 спроба развянчаць ідэю сац. і маральнай адказнасці мастацтва (апавяданні «Крывавая пляма», «На белым снезе», аповесці «Чалавечая хваля» і інш.). Рэчаіснасць у іх спалучалася з натуралістычным апісаннем жахаў і самазабойстваў. У гады рэакцыі прымкнуў да ўпадніцкага кірунку ў л-ры. У аповесцях «Мільёны» (1908), «Рабочы Шавыроў» (1909), раманах «Санін» (1907), «Ля апошняй рысы» (1910—11) амаралізм, сексуальная разбэшчанасць, сац. песімізм, адмаўленне грамадскіх ідэалаў. Пасля Кастр. рэвалюцыі эмігрыраваў за мяжу.

Л.А.Арцымовіч.

**АРЦЫМО́ВІЧ** Леў Андрэевіч (25.2.1909, Масква — 1.3.1973), сав. фізік. Акад. АН СССР (1953, чл.-кар. з 1946), праф. (1947). Герой Сац. Працы (1969). Скончыў БДУ (1928). З 1930 у фізіка-тэхн. ін-це, з 1944 у Ін-це атамнай энергіі, з 1957 акад.-сакратар Аддз. агульнай фізікі і астраноміі АН СССР. Навук. працы ў галіне атамнай і ядз. фізікі, электроннай оптыкі, фізікі плазмы. Даказаў выкананне закону захавання імпульсу пры анігіляцыі электрона і пазітрона, распрацаваў эл.-магн. метад раздзялення ізатопаў, упершыню атрымаў тэрмаядз. рэакцыю ва ўстойлівай квазістацыянарнай плазме (у сааўт.). Ленінская прэмія 1958. Дзярж. прэміі СССР 1953, 1971.

*Тв.:* Избр. труды. М., 1978.

*Літ.:* Академик Л.А.Арцимович: (Сб. статей). М., 1975.

**АРЦЫХО́ЎСКІ** Уладзімір Мартынавіч (8.7.1876, Жытомір, Украіна — 13.6.1931), батанік. Скончыў Пецярбургскі ун-т (1900). Праф. Данскога політэхн. ін-та (1907—22). З 1922 у Лясным НДІ драўніны ў Маскве. На-

вук. працы па стэрылізоўным дзеянні ядаў на насенне, экалогіі пустынных раслін, марфалогіі і біялогіі ніжэйшых арганізмаў, пігментах, пошуку хларафілу на інш. планетах, заснавальнік фізіялогіі драўнінных пародаў. Распрацаваў метад аэрапонікі (1910).

**АРЧАКО́ВА** Людміла Іванаўна (н. 8.9.1936, Мінск), бел. эмбрыёлаг і гістолаг. Д-р біял. н. (1993). Скончыла Мінскі мед. ін-т (1959). З 1959 у Ін-це фізіялогіі АН Беларусі. Навук. працы па структуры і хім. прыродзе цэнтр. і перыферычных кампанентаў вегетатыўнай нерв. сістэмы, рэцэпторных апаратах сімпатычных гангліяў.

**АРЧЫ́Л II** (1647 — 27.2.1713), цар Імерэтыі і Кахетыі, пісьменнік і гісторык.

Пасля працяглай і беспаспяховай барацьбы супраць Персіі і Турцыі і з феад. міжусобіцамі ў 1699 пакінуў сваю краіну і перабраўся ў Расію, дзе заснаваў груз. калонію (у с. Усіхсвяцкім, пад Масквою). Стваральнік першай груз. друкарні. Аўтар паэт. зб. «Арчыліяні», гіст. паэмы «Спрэчка Тэймураза з Руставелі».

**АРЧЫМБО́ЛЬДА** (Arcimboldo) Джузепе (1527, Мілан — 11.7.1593), італьянскі мастак. Жыў у Вене, Празе, Мілане. Майстар фрэсак, жывапісец, тэатр. дэкаратар, графік. У маньерыстычным кірунку вынайшаў свой алегарычны стыль адлюстравання, звязаны з парадаксальнай фантазіяй. Выканаў серыі партрэтаў, складзеных з раслін, прадметаў, сімвалаў і г.д. Сярод вядомых работ: «Лета», «Зіма» (1569), «Флора» (1589), «Партрэт Рудольфа II» (1590) і інш. Творчасць мастака — унікальны прыклад позняга маньерызму.

*Я.Ф.Шунейка.*

**АРШАКІ́ДЫ** (Аршакуні) армянскія, царская дынастыя ў Арменіі ў 62—428. Роднасная Аршакідам парфянскім. Заснавальнік Тырыдат I (з 62, афіцыйна ў 66—80). Пры Хасрове I Вялікім [217—238] улада А. стала спадчынная. З часу царавання Тырыдата III Вялікага [287—332] хрысціянства стала (каля 301) дзярж. рэлігіяй Арменіі. А. змагаліся за незалежнасць дзяржавы, але беспаспяхова. Пасля падзелу *Арменіі Вялікай* у 387 паміж Іранам і Рымам А. трапілі да іх у залежнасць. У 428 дынастыя А. спынілася.

**АРША́НСКАЕ ЕВА́НГЕЛЛЕ**, бел. рукапісны помнік канца 12 — пач. 13 ст. Выяўлена ў Оршы ў 1812. Верагодна, створана на Полаччыне. Зберагліся 142 аркушы (без пачатку і канца), пісаныя ўставам на высакаякасным пергаменце. У А.е. змешчаны 2 мініяцюры з выявамі евангелістаў Лукі і Мацвея (найб. ранніе ва ўсх.-слав. рукапісах), 2 застаўкі і 310 ініцыялаў з варыяцыямі старавізантыйскіх і першапачатковых тэраталагічных формаў (у асобных ініцыялах — выявы чалавека). За рэліг. абалонкай праглядаецца жывая нар. аснова, што збліжае іх з размалёўкамі Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра ў Полацку. Зберагаецца ў Цэнтр. навук. бібліятэцы АН Украіны.

**АРША́НСКАЕ ПАТРЫЯТЫ́ЧНАЕ ПАДПО́ЛЛЕ** ў Вялікую Айчынную вайну. Дзейнічала з ліп. 1941 да чэрв. 1944 у г. Орша і Аршанскім р-не Віцебскай вобл. Аб'ядноўвала больш за 800 падпольшчыкаў. Мела каля 80 груп, у т.л. на чыг. вузле (К.У.Грачыха, М.П.Кузьмін, Е.М.Шамшурава), ільнокамбінаце (І.К.Петрачэнка), у друкарні (А.П.Нікалаеў), лагеры ваеннапалонных (В.А.Марчак), вёсках Вял. Сяло, Высокае, Дзевіна, Шыбекі, пас. Юрцава і інш. З ліст. 1941 на чыг. вузле пачала дзейнічаць група К.С.*Заслонава*. Патрыёты груп Дз.М.Бохана, братоў А., Б., І. і К.І.Бяляўскіх, Ф.Я.Коўтуна, З.М.Шэвень узрывалі эшалоны ворага з жывой сілай, тэхнікай, боепрыпасамі і гаручым; на ст. Самалюбаўка на 7 дзён спынілі рух паяздоў. Падпольшчыкі вялі растлумачальную работу сярод варожых фарміраванняў; у час падрыхтоўкі Бел. аперацыі 1944 перадалі сав. камандаванню больш за 200 картаў, схем і інш. звестак аб умацаваннях праціўніка. *Л.В.Аржаева.*

Дж.Арчымбольда. Зіма. 1569.

Да арт. Аршанскае евангелле. Евангеліст Лука. Мініяцюра. 13 ст.

**АРША́НСКАЕ ПАЎСТА́ННЕ 1918.** Адбылося 5—6 жн., найбуйнейшае ў ланцугу леваэсэраўскіх мяцяжоў 1918. Повадам паслужыла адпраўка чырвонаармейцаў на Усх. фронт. Кіраўнікі паўстання — мясц. эсэры Буевіч, Пятражыцкі, Іваноў. Большасць чырвонаармейцаў Невельскага, Аршанскага пяхотнага, 1-га Бел. коннага палкоў, артдывізіёна былі з мясц. сялян, якія лічылі найпершай задачай барацьбу з ням. акупантамі. Да іх далучыліся чырвонаармейцы Стайкаўскага і Сенненскага палкоў. Паўстанцы выступілі супраць улады Саветаў, *Брэсцкага міру 1918.* Аршанскі Савет рабочых, чырвонаармейскіх і сял. дэпутатаў быў ліквідаваны, як орган улады створаны рэўкам. Паўстанне задушылі чырвонаармейскія часці з Віцебска пад кіраўніцтвам С.Крылова і Смаленска пад камандаваннем Я.Адамовіча, конніца, 2 браневікі, атрад чэкістаў на чале з нам. старшыні ЧК Зах. вобл. Я.Кромбергам.

*Н.І.Стужынская.*

**АРША́НСКАЕ ПРА́ВА**, своеасаблівы юрыдычны статут гар. саслоўя, які ў адпаведнасці з нормамі *магдэбургскага права* сфарміраваўся ў г. Орша на працягу 14—17 ст. Органы самакіравання Оршы зацверджаны вял. князем у 16 ст. У 1620 горад атрымаў прывілей на поўнае магдэбургскае права, на падставе якога аршанцы ў сак. 1621 склалі ўласны статут з 23 раздзелаў. Статут рэгуляваў дзейнасць гар. рады, яе судовыя функцыі, маёмасныя і асабістыя адносіны жыхароў горада. А.п. аспрэчвала юрыд. аўтарытэт магдэбургскага права, адхіляла тыя яго нормы, якія не адпавядалі ўмовам жыцця бел. горада 17 ст., а таксама ўстарэлыя нормы вечавога права. Патрэбныя нормы былі ўзяты са Статута ВКЛ 1588, статутаў Вільні і Кракава, пастаноў соймаў і вопыту тагачаснага гар. жыцця. *З.Ю.Капыскі.*

**АРША́НСКАЕ ЎЗВЫ́ШША**, фізіка-геаграфічны раён ва ўсх. ч. *Беларускай грады* на ПдУ Віцебскай і ПнУ Мінскай абласцей. Уваходзіць у *Беларуска-Валдайскую правінцыю*. Мяжуе з Чашніцкай раўнінай і Лучоскай нізінай на Пн, Верхнебярэзінскай ніз. на ПнЗ, Мінскім узв. на З, Цэнтральнабярэзінскай, Аршанска-Магілёўскай і Гора-

шка-Мсціслаўскай раўнінамі на Пд і ПдУ. Выцягнута з З на У на 110 км, з Пн на Пд на 10—60 км. Абс. вышыні ад 150 м над узр. м. (урэз вады ў р. Дняпро) да 265 м (каля в. Янова Сенненскага р-на), пераважаюць 200—250 м. Над суседнімі раўнінамі і нізінамі ўзнімаецца на 100—127 м. Пл. каля 2,5 тыс. км$^2$. А.ў. — краявое акумулятыўнае ўзвышша лёдападзельнага тыпу сожскага ледавіка, да якога на Пн прымыкаюць невял. краявыя грады паазерскага зледзянення.

У геаструктурных адносінах прымеркавана да *Аршанскай упадзіны*. У будове ўзвышша пераважаюць ледавіковыя адклады трох-чатырох зледзяненняў, міжледавіковыя адклады менш развіты. Магутнасць тоўшчы антрапагенавай сістэмы 60—80 м, на лакальных падняццях ложа яна памяншаецца да 18 м, у ледавіковых лагчынах павялічваецца да 200 м. Карысныя выкапні: дэвонскія даламіты і даламітызаваныя вапнякі, антрапагенавыя цагляна-чарапічныя і керамічныя гліны, пясчана-жвіровы матэрыял, торф. Вялікія запасы прэсных і мінер. водаў у *Аршанскім гідрагеалагічным басейне*, які ахоплівае ўсе гарызонты асадкавага чахла і частку крышт. фундамента.

У рэльефе А. ў. вылучаюцца 2 няроўныя часткі. Меншая, паўн.-ўсх., характарызуецца градава-ўзгорыстым канцова-марэнным і камавым рэльефам *Аршанскага стадыяла* паазерскага зледзянення. Утварае выгнутую на Пд дугу, вышыня асобных узгоркаў 10—12 м, паміж імі шматлікія лагчыны сцёку талых ледавіковых водаў, тэрмакарставыя западзіны. Рэльеф асн. часткі А. ў. (лёдападзельнага масіву *Ашмянскага стадыяла* перадапошняга зледзянення) узгорыста-ўвалісты і спадзіста-хвалісты, перапрацаваны *дэнудацыяй*, з перарывістым покрывам лёсападобных парод магутнасцю 0,5—7 м. Месцамі да схілаў прымыкаюць флювіякамы, камавыя масівы і озы. На водападзелах суфазійныя западзіны (да 2 м), у прырэчных частках, асабліва на правабярэжжы Дняпра, глыбокія лагчыны і разгалінаваныя яры да 15—20 м глыбіні. У Мацвеевым Рове (каля г.п. Копысь) агаленне адкладаў *александрыйскага міжледавікоўя*. Адметная рыса А.ў. — скразныя даліны, найб. выразная паміж вярхоўямі рэк Друць і Усвейка. Т-ра студз. -7,8 °С, ліп. 18 °С, ападкаў 630 мм за год. Па А.у. праходзіць частка водападзелу паміж бас. Балтыйскага і Чорнага мораў, тут пачынаюцца рэкі Усвейка і Абалянка (бас. Зах. Дзвіны), Бобр, Друць і Адроў (бас. Дняпра). Ёсць невял. зарослыя азёры ў западзінах. Глебы дзярнова-падзолістыя сугліністыя, радзей супясчаныя на лёсападобныхародах, у паніжэннях — тарфяна-балотныя нізінныя, у далінах — поймавыя дзярнова-балотныя. Лясы мяшана-шыракалістыя, захаваліся на ўзгорыстых і забалочаных участках (каля 20% тэрыторыі). Пераважаюць ельнікі, субары, драбналістыя лясы. Лугі б.ч. сухадольныя. Месцамі нізінныя балоты. Пад ворывам каля 50% тэрыторыі.

*М.Я.Камароўскі.*

**АРША́НСКА-МАГІЛЁЎСКАЯ РАЎНІ́НА**, фізіка-геаграфічны раён *Усходне-Беларускай правінцыі*. Займае тэрыторыю на ПнЗ Магілёўскай і невял. ч. на Пд Віцебскай абл. Мяжуе з Цэнтральнабярэзінскай раўнінай на З, Аршанскім узв. на Пн, Горацка-Мсціслаўскай раўнінай на ПнУ і Чачэрскай раўнінай на Пд. Працягнулася з ПнЗ на ПдУ больш як на 200 км, з З на У ад 50 да 120 км. Вышыні 150—200 м, найвыш. пункт 224 м над узр. м. каля в. Палыкавічы Шклоўскага р-на, найніжэйшы — 131 м у даліне р. Сож у Чэрыкаўскім р-не (абодва ў Магілёўскай вобл.). Адносныя перавышэнні

**Аршанскае ўзвышша** ў Талачынскім раёне.

над суседнімі раўнінамі на З і Пд 40—50 м. Пл. каля 11,5 тыс. км$^2$.

У тэктанічных адносінах раўніна прымеркавана да *Аршанскай упадзіны*. Магутнасць антрапагенавых адкладаў у сярэднім 50—80 м, у лагчынах ледавіковага выворвання і размыву да 200 м. У будове антрапагенавага покрыва ўдзельнічаюць пераважна адклады бярэзінскага, дняпроўскага з сожскім зледзяненняў, александрыйскага і муравінскага міжледавікоўяў, галацэну. Адметная роля ў фарміраванні сучаснай паверхні належыць лёсападобным адкладам магутнасцю да 10—12 м, якія намножыліся ў час адступання апошняга, *паазерскага зледзянення*. Яны перакрываюць больш старажытныя марэнныя і флювіягляцыяльныя адклады. Карысныя выкапні: легкаплаўкія гліны, сілікатныя буд. пяскі, пясчана-жвіровы матэрыял, цэментныя мел і мергель, фасфарыты, торф, падземныя воды.

Асн. рысы сучаснага рэльефу сфарміраваліся ў перыяд адступання сожскага ледавіка. Пераважае флювіягляцыяльная раўніна з хвалістай і спадзіста-хвалістай паверхняй, а таксама спадзіста-хвалістая і дробнаўвалістая марэнная раўніна. Водападзельныя ўчасткі ў познім плейстацэне і ў галацэне набылі платопадобны выгляд, прыдалінныя схілы былі парэзаны эрозіяй, якой садзейнічалі лёсападобныя пароды. Часта трапляюцца суфазійныя западзіны, калдобіны, прамывіны. Найдаўжэйшыя і найглыбейшыя маладыя яры і старыя спадзістыя яры і лагчыны прымеркаваны да схілаў рачных далін і дасягаюць даўж. 2—3 км, глыб. 20—30 м. Рачная сетка належыць да бас. Дняпра. Найб. рэкі Дняпро (ад Оршы да Магілёва), Проня з Басяй і Растой, Сож з Волчасам, Лабжанкай і Сянной. На Пд цякуць правыя прытокі Беседзі — Жадунька з Крупняй, Дзяржня. Т-ры студз. ад -7,5 да -8,2 °С, ліп. 17,8—18,5 °С. Ападкаў 600—645 мм за год. Глебы дзярнова-падзолістыя (найб. урадлівыя дзярнова-палева-падзолістыя). Глебаўтваральныя пароды — лёсападобныя суглінкі і супескі, радзей трапляюцца марэнныя суглінкі, супескі і пяскі. Пад лесам 20—30% тэр., пераважаюць хвоя і бяроза, значная доля елкі і дуба (раўніна ў падзоне дубова-цемнахвойных лясоў). Пад с.-г. ўгоддзямі 50—70% тэр. (пад ворнымі землямі 35—45%). У межах А.-М.р. *Чэрыкаўскі паляўнічы заказнік*.

*Н.К.Кліцунова, І.Э.Паўлоўская.*

**АРША́НСКАЯ АКРУ́ГА**, адм.-тэр. адзінка на Беларусі ў 1924—30. Утворана 17.7.1924. Цэнтр — г. Орша. Пл. акругі 7,9, у 1927 11,7 тыс. км$^2$; нас. 423,3 у 1924, 572,3 тыс. чал. у 1927. Уключала: 10 раёнаў — Аршанскі, Багушэўскі, Горацкі, Дрыбінскі, Дубровенскі, Копыскі, Коханаўскі, Круглянскі, Ляднянскі, Талачынскі; 3 гарады — Горкі, Дуброўна, Орша; 5 мястэчак — Копысь, Коханава, Ляды, Смаляны, Талачын; 108 сельсаветаў. У 1927 у склад акругі ўвайшлі са скасаваных Барысаўскай акругі Крупскі і Чарэйскі, з Калінінскай — Мсціслаўскі і Расненскі р-ны. Акруговая газ. «Камуністычны шлях». Скасавана 26.7.1930.

**АРША́НСКАЯ БІ́ТВА 1514**, адбылася 8.9.1514 пад Оршай (Віцебская вобл.) паміж войскамі ВКЛ і Маскоўскай дзяржавы.

Неўзабаве пасля капітуляцыі Смаленска перад рус. войскамі (жн. 1514) вял. кн. маскоўскі Васіль III паслаў 80-тысячнае войска з коннікаў, дваран і «дзяцей баярскіх» на чале з кн. М.І.Булгакавым-Голіцам і І.А.Чаляднінным у напрамку Оршы і Друцка. Паводле польскіх гісторыкаў, кароль польскі і вял. князь ВКЛ Жыгімонт I Стары сабраў апалчэнне ВКЛ пад камандаваннем вял. гетмана ВКЛ кн. К.І.Астрожскага (16 тыс. коннікаў), 14 тыс. польскіх коннікаў, 3 тыс. наёмнай пяхоты, атрады паноў з Малой Польшчы і шляхціцаў-добраахвотнікаў з Вял. Польшчы (2500 коннікаў). Паводле звестак рускага гісторыка М.К.Любаўскага, польскіх коннікаў было 4 тыс., а частка польскіх салдатаў засталася ў Бярэсці і Барысаве. Жыгімонт застаўся ў Барысаве з 4-тысячным войскам, а асн. сілы (больш за 30 тыс. чал.) на чале з Астрожскім пайшлі пад Оршу. Атрадамі войска камандавалі Ю.Радзівіл, Я.Свярчоўскі і інш. Папярэднія баі адбыліся 27.8.1514 на р. Бярэзіна, пазней на р. Друць. Перад бітвай рус. войска пераправілася на левы бераг Дняпра і стала паміж Оршай і Дуброўнам на

р. Крапіўна. Частка конніцы князя Астрожскага без страт пераправілася цераз Дняпро. Вышэй па цячэнні па наплаўным мосце раку перайшлі пяхота, конніца і артылерыя. Астрожскі павёў войска ў атаку на палкі Булгакава-Голіцы. Чаляднін у бой не ўступіў, а калі ўдар абрынуўся на яго палкі, то ад бою ўхіліўся Булгакаў-Голіца. Пад выглядам адступлення Астрожскі ўцягнуў праціўніка ў пагоню і вывеў яго пад агонь сваіх замаскіраваных гармат. Пасля гэтага ён зноў нанёс удар па палках Булгакава-Голіцы, якія былі разбіты і часткова трапілі ў палон. Былі разгромлены і палкі Чалядніна. У рус. войску пачалася паніка. Многія з уцекачоў загінулі ў Дняпры і Крапіўне. Паводле летапісаў і звестак рускіх гісторыкаў, рус. войска страціла 40 тыс. чал. У палон трапілі Булгакаў-Голіца, Чаляднін і яшчэ 8 ваявод, 17 інш. военачальнікаў, 2 тыс. «дзяцей баярскіх» і больш за 2 тыс. воінаў. Пераможцам раздалі 20 тыс. трафейных коней і палавіну абозу. А.б. — адна з буйнейшых бітваў на тэр. Еўропы ў пач. 16 ст. Перамога ў ёй дала магчымасць вярнуць Дуброўну, Мсціслаў і Крычаў. Смаленск узяць не ўдалося, аднак пасля бітвы да 1518 не адбывалася ўварванняў маск. войскаў на Беларусь. Пра бітву была складзена бел. песня, якая праслаўляла кн. Астрожскага, на тэму А.б. ў 1520—30-я г. напісана батальная карціна (аўтар невядомы, зберагаецца ў Нац. музеі ў Варшаве) — першая ва Усх. Еўропе.

*Літ.:* Грыцкевіч А., Трусаў А. Бітва пад Оршай // Мастацтва Беларусі. 1990. № 8; Военная энциклопедия. Пг., 1914. Т. 17. С. 186—187; Грыцкевіч А. Бітва пад Оршай 8 верасня 1514 г. // Спадчына. 1992. № 6; Зимин А.А. Россия на пороге нового времени. М., 1972. С. 166—167; Zarys dziejów wojskowosci polskiej do roku 1864. Warszawa, 1965 T. 1. S. 333—336. Stryjkowski M. Kronika Polska, Litewska, Żmódzka i wszystkiej Rusi. Warszawa, 1846. T. 2. S. 378—384. *А.П.Грыцкевіч.*

**Аршанская бітва 1514**. Гравюра 16 ст.

**АРША́НСКАЯ БІ́ТВА 1564**, адбылася пад Оршай у канцы студз. ці пач. лют. паміж авангардам войска Маск. дзяржавы на чале з ваяводам П.Сярэбраным і атрадам войска ВКЛ на чале з Ф.Кмітам-Чарнабыльскім і Ю.Осцікавічам у ходзе Інфлянцкай вайны 1558—82. Групоўка рус. войска (паводле М.Стрыйкоўскага, 50 тыс. чал.) паспешна адступіла: яе камандаванне палічыла, што ў бой уступілі асн. сілы ВКЛ, якія нанеслі паражэнне другой групоўцы рус. войск у *Ульскай бітве 1564*. У выніку гэтай бітвы і бітвы на Уле на 1-м этапе вайны была адноўлена ваен. раўнавага паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай.

**АРША́НСКАЯ ЖАНО́ЧАЯ ГІМНА́ЗІЯ**. Існавала ў Оршы ў 1903—18. Тэрмін навучання 7 гадоў; мела падрыхтоўчы клас. У 1911 было 439 выхаванак. Выкладаліся рус. мова і л-ра, матэматыка, прыродазнаўства, маляванне, чыстапісанне, гісторыя, геаграфія, рукадзелле, ням. і франц. мовы. У 1918 рэарганізавана ў школы 1-й (1—3-і

АРШАНСКАЯ БІТВА 1514 г.



класы) і 2-й (4—7-ы класы) ступені з навучаннем асоб абодвух полаў.
*А.Ф.Самусік.*

**АРША́НСКАЯ ЖАНО́ЧАЯ НАСТА́ЎНІЦКАЯ СЕМІНА́РЫЯ.** Існавала ў Оршы ў 1911—19. Рыхтавала настаўніц пач. нар. вучылішчаў. Тэрмін навучання 4 гады. Мела падрыхтоўчы клас і ўзорнае пач. вучылішча, у якім семінарысткі праходзілі практыку. Навучалася 113 выхаванак (1914). Выкладаліся: Закон Божы, рус. мова і л-ра, царк.-слав. мова, педагогіка, псіхалогія, матэматыка, гісторыя, геаграфія, прыродазнаўства, фізіка, графічныя мастацтвы (чыстапісанне, маляванне, чарчэнне), методыка навуч. прадметаў, ручная праца, рукадзелле, спевы, музыка, сельская гаспадарка, фізічныя практыкаванні і інш. У ліп. 1917 семінарыя рэарганізавана ў сяроднюю пед. навуч. ўстанову для асоб абодвух полаў. З 1918 рыхтавала выкладчыкаў для 1-й ступені адзінай прац. школы. У 1919 пераўтворана ў 3-гадовыя пед. курсы.

**АРША́НСКАЯ ІЛЬІ́НСКАЯ ЦАРКВА́**, помнік архітэктуры псеўдарускага стылю. Пабудавана ў 1880 у Оршы на месцы царквы 1460 на левым беразе Дняпра.

Храм крыжова-купальнай кампазіцыі з 5-граннай апсідай і шатровай званіцай. Фасады дэкарыраваны філёнгамі, раскрапоўкамі, карнізамі, какошнікамі. Цэнтр. частка асн. аб'ёму завершана купалам. Тэр. царквы абнесена каменнай агароджай з брамай, вугламі вежамі і контрфорсамі.

**АРША́НСКАЯ КАНФЕРЭ́НЦЫЯ СЯЛЯ́Н 1906.** Адбылася ў снеж. 1906 у адной з вёсак Аршанскага пав. Склікана Магілёўскім акр. к-там РСДРП сумесна з аршанскімі арг-цыямі РСДРП і эсэраў дзеля згуртавання сялян на антыўрадавай і антыпамешчыцкай платформе напярэдадні выбараў у II Дзярж. думу. Канферэнцыя з рэв.-дэмакр. пазіцый ацаніла значэнне Дзярж. думы як органа, які дапаможа народу згуртавацца на далейшую барацьбу, падтрымала план сумесных дзеянняў левых сіл на валасных, павятовых і губернскіх выбарчых сходах. Сведчыла пра свядомыя адносіны перадавога сялянства да паліт. жыцця. *З.В.Шыбека.*

**АРША́НСКАЯ ПЕНЬКАТРАПА́ЛЬНАЯ МАНУФАКТУ́РА.** Дзейнічала ў 1880—81 у г. Орша. Працавала 75 чал., апрацавана 15 тыс. пудоў (240 т) пянькі на 16,5 тыс. руб.

**АРША́НСКАЯ ПРАВІ́НЦЫЯ**, адм.-тэр. адзінка ў 1772—77 у Магілёўскай губ. Цэнтр — г. Орша. Узначальвалася ваяводам. Пл. 954 690 дзес., падатковага насельніцтва 205 530 чал. (1774). У 1773 падзялялася на Аршанскі, Дубровенскі і Сенненскі пав., уключала 6 старостваў.

**АРША́НСКАЯ ЎПА́ДЗІНА**, адмоўная геаструктура Усх.-Еўрапейскай платформы на ПнУ Беларусі і сумежнай тэр. Расійскай Федэрацыі. Выцягнута з ПдЗ на ПнУ на 250 км, у шырыню на 120—210 км. Абмежавана на З Беларускай, на У Варонежскай антэклізамі, на Пд Жлобінскай, на Пн і ПнЗ Веліжскай і Латвійскай седлавінамі. Фарміраванне пачалося ў сяроднім рыфеі, скончылася ў раннім вендзе. Адасоблена толькі па паверхні фундамента і адкладах рыфею і ніжняга венду. Паверхня фундамента найб. апушчана ў цэнтры А.у. — да -1,6 км у Віцебскай, да -1,4 км у Магілёўскай мульдах, якія падзелены Цэнтральна-Аршанскім горстам; на ПдЗ вылучаецца Чэрвеньскі структурны заліў. Платформавы чахол

Аршанская Ільінская царква.

уключае адклады сяроднерыфейскага (да 450 м магутнасцю), верхнерыфейска-ніжнявендскага (да 900 м), верхнявендскага (да 280 м), сяроднедэвонсканіжнекаменнавугальнага (да 200 м) і юрска-антрапагенавага (да 190 м) комплексаў. Разломы расчляняюць у асн. рыфейскія і ніжнявендскія адклады. З А.у. звязаны *Аршанскі гідрагеалагічны басейн.*

*Літ.:* Айзберг Р.Е., Гарецкий Р.Г., Климович И.В. Тектоника Оршанской впадины. Мн., 1985. *Р.Я.Айзберг.*

**АРША́НСКІ** Эдуард Львовіч (25.8.1899, г. Невель Пскоўскай вобл. — 6.7.1974), бел. кінарэжысёр. Скончыў Дзярж. ін-т кінематаграфіі ў Маскве (1931). У 1931—41 рэжысёр кінастудыі «Савецкая Беларусь», дзе паставіў маст. фільмы «Баям насустрач» (1932), «Двойчы народжаны» (1934), «Новая Радзіма» (1935), «Салавей» (1937). З 1950 на Ленінградскай студыі кінахронікі.

Аршанскі замак. Малюнак з карты.

**АРША́НСКІ ГІДРАГЕАЛАГІ́ЧНЫ БАСЕ́ЙН**, на ПнУ Беларусі, прымеркаваны да *Аршанскай упадзіны*. Зах. частка Маскоўскага гідрагеалагічнага мегабасейна. Зона актыўнага водаабмену (150—300 м) ахоплівае ваданосныя комплексы ў адкладах антрапагену, мелу, юры і верхняга дэвону. Воды прэсныя, гідракарбанатныя, мінералізацыя 0,1—0,4 г/л, напорныя, за выключэннем верхніх гарызонтаў. Рэсурсы складаюць 16,6 млн. м$^3$/сут. Дэбіт свідравін 0,5—20,0 л/с, максімальны больш за 50 л/с. У зону запаволенага водаабмену ўваходзяць сяроднедэвонскі (пярнуска-нараўскі) і верхнепратэразойскі ваданосныя комплексы. Пярнуска-нараўскі мае мінер. воды (мінералізацыя 2—20 г/л) сульфатнага, сульфатна-хларыднага і хларыднага саставу. Глыбей у верхнепратэразойскіх адкладах (верхнепратэразойскі ваданосны комплекс) воды расольныя і расолы хларыдна-натрыевага саставу з макс. канцэнтрацыяй соляў 100—175 г/л. У гэтых водах значная колькасць брому, ёду, фтору і інш. Дэбіт свідравін у межах 0,2—20 л/с. Прэсныя воды выкарыстоўваюцца на гасп. водазабеспячэнне, мінер. і расолы — як бальнеалагічныя ў санаторыях («Лётцы», «Прыдняпроўскі»).
*М.Г.Ясавееў.*

**АРША́НСКІ ЕЗУІ́ЦКІ КАЛЕ́ГІУМ.** Дзейнічаў у 1612—1820 у Оршы. Заснаваны па фундацыі караля Рэчы Паспалітай Жыгімонта III Вазы, які разам з канцлерам ВКЛ Л.Сапегам і ксяндзом Лаўрэнціем у 1609 распрацаваў план яго стварэння, а ў 1610—11 падараваў аршанскім езуітам 210 валок зямлі з прыгоннымі сялянамі в. Князі, Крыніцы, Цянкі, Чабаданы, Чално, Чэрніца; у 1616 — маёнтак Фашчаўка (больш за 2 тыс. сялян). Кароль надзяліў езуітаў манаполіяй на адукацыю шляхетнай моладзі ў горадзе і Аршанскім пав. У калегіуме выкладаліся рыторыка, логіка, філасофія. У 1634 адкрыты 2 бурсы: музычная і для шляхетнай моладзі са збяднелых сем'яў. У час вайны Расіі з Рэччу Паспалітай (1654—67) калегіум на 9 гадоў прыпыніў дзейнасць. Пажар 1680 знішчыў усе пабудовы, праз 3 гады адбудаваны. У калегіуме быў створаны *«Аршанскі кодэкс»*.

*Літ.:* Демьянович А. Иезуиты в Западной России в 1569—1772 гг. Спб., 1872; Митрошенко И.Я. Иезуиты в восточной части Белоруссии с 1579 по 1772 год // Полоцко-Витебская старина. Витебск, 1912. Вып. 2. *Т.Б.Бліновa.*

**АРША́НСКІ ЗА́МАК.** Існаваў у 14—17 ст. у сутоках Дняпра і Аршыцы на месцы гарадзішча 11 ст. (сучасны г. Орша). Мураваны 5-вежавы замак будаваўся з 1398 па 1407, не закончаны, у 15

ст. дабудаваны з дрэва. Меў патаемны ход да Дняпра. Пасля 1620 замак цалкам дабудаваны з каменю. На яго ўзбраенні былі гарматы, у цэйхгаузе захоўваліся 33 гакаўніцы, 20 аркебузаў, 3 невял. жалезныя гарматы, інш. ваен. рыштунак. Замак неаднаразова зведаў аблогі і захопы рус. войскамі (1500, 1507, 1519, 1562—64, 1654). У снеж. 1654 войска Радзівіла авалодала замкам і ўтрымлівала яго да 11.5.1655. Пазней рус. войскі занялі яго і ўтрымлівалі да канца вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67. У канцы 17 ст. замак заняпаў і страціў свае абарончыя функцыі.

**АРША́НСКІ ІНСТРУМЕНТА́ЛЬНЫ ЗАВО́Д.** Уведзены ў дзеянне ў 1973—75 у Оршы як з-д па выт-сці нармалізаванага інструменту для аўтам. ліній. З 1974 інструментальны з-д. Асн. прадукцыя (1995): металарэзны інструмент (разцы, зенкеры, раскруткі, метчыкі, свярдзёлкі, пілы), тавары шырокага ўжытку. Пры з-дзе ПТВ металістаў.

**АРША́НСКІ КАМБІНА́Т ЗБО́РНЫХ ЖАЛЕЗАБЕТО́ННЫХ ВЫ́РАБАЎ І КАНСТРУ́КЦЫЙ.** Пабудаваны ў 1968—69. Асн. прадукцыя (1995): зборны жалезабетон (пустотны насціл, палі, рыгелі, пліты дарожныя, аэрадромныя, перакрыцці, апорныя асвятляльныя і цэнтрыфугаваныя калоны). Выт. магутнасць 184 м$^3$ жалезабетонных вырабаў за год (1994).

**АРША́НСКІ КЛЯ́ШТАР БЕРНАРДЗІ́НЦАЎ.** *Існаваў у 1636—1832 у* Оршы. Засн. Андрэем і Крысцінай Млоцкімі, якія выдзелілі пад кляштар пляц і 6 маргоў зямлі. Мураваныя будынкі касцёла і 2-павярховага жылога корпуса пастаўлены ў 2-й пал. 18 ст. на ахвяраванні жыхароў. Касцёл, пашкоджаны паводкай 1760, пазней заняты пад ваенны склад, у 1817—19 адрамантаваны і вернуты духавенству. Пасля закрыцця кляштара жылы корпус заняты пад шпіталь. Касцёл не ўцалеў.

*А.А.Яршэвіч.*

**АРША́НСКІ КЛЯ́ШТАР ДАМІНІКА́НЦАЎ.** Існаваў у 1653—1832 у Оршы. Заснаваў кн. Геранім Друцкі-Сакалінскі і аддаў кляштару фальварак Воскава. У 1816—19 пабудаваны касцёл св. Іосіфа. Пры кляштары быў шпіталь на 10 хворых. Пасля закрыцця кляштара касцёл стаў парафіяльным, пасля Вял. Айч. вайны ў ім размяшчаўся Дом культуры, з 1990 дзейнічае.

*А.А.Яршэвіч.*

**АРША́НСКІ КЛЯ́ШТАР ТРЫНІТА́РЫЯЎ.** Існаваў у 1714—1832 у Оршы. Засн. Адамам і Уладзіславам Саковічамі. Мураваныя будынкі касцёла і 2-павярховага жылога корпуса пастаўлены ў 18 ст. У 1836 касцёл пераабсталяваны ў праваслаўны Васкрасенскі сабор, у 1920-я г. закрыты, у 1950-я г. знесены. Захаваўся жылы корпус.

*А.А.Яршэвіч.*

**АРША́НСКІ КЛЯ́ШТАР ФРАНЦЫСКА́НЦАЎ.** Існаваў у 1680—1832 у Оршы. Засн. рэчыцкім стольнікам Вой-

*Аршанскі Куцеінскі Богаяўленскі манастыр. Святадухаўская царква. З малюнка Д. Струкава. 19 ст.*

цехам Станіславам Катоўскім. Мураваны касцёл з бакавой вежай-званіцай асвячоны 10.8.1768. Тады ж пабудаваны жылы корпус, у якім пасля закрыцця кляштара размяшчаліся інвалідная каманда, потым арыштанцкі дом, у 1920—30-я г. рамеснае вучылішча. Касцёл знесены ў 1970-я г.

*А.А.Яршэвіч.*

**«АРША́НСКІ КО́ДЭКС»,** рукапісны зборнік, створаны ў Аршанскім езуіцкім калегіуме ў канцы 17 ст. (да 1693). Уключае 4 польскія барочныя драмы з бел. інтэрмедыямі, якія ставіліся ў школьных тэатрах у Полацку («Духоўнае прычасце святых Барыса і Глеба»), Оршы («Слаўная дапамога для Раміравай перамогі, учыненая анёльскімі палкамі»), Навагрудку («Містычнае прычасце ў жалю нявінных Караля і Фрыдэрыка»), Віцебску («Містычнае вяселле прычасця Генсерыка і Трызімунда»). У інтэрмедыях адна або дзве асобы гавораць на бел. мове. Захоўваецца ў бібліятэцы імя Асалінскіх у Вроцлаве (Польшча).

**АРША́НСКІ КУЦЕ́ІНСКІ БОГАЯЎЛЕ́НСКІ МАНАСТЫ́Р,** помнік архітэктуры барока. Заснаваны ў 1623 як праваслаўны мужчынскі манастыр. Размешчаны на паўн.-зах. ускраіне Оршы ў суточках Дняпра і Куцеінкі. Складаўся з галоўнага Богаяўленскага сабора, Святадухаўскай царквы, званіцы, манастырскіх і гасп. пабудоў. Быў абнесены агароджай з бутавага каменю і цэглы. Драўляны Богаяўленскі сабор пабудаваны ў 1623—35; згарэў у 1888. У 1630 бел. асветнік і кнігадрукар Спірыдон Собаль заснаваў пры манастыры *Куцеінскую друкарню.* Захаваліся Святадухаўская царква (узведзена ў 1-й пал. 17 ст.), манастырскі будынак, частка сцяны.

*Т.В.Габрусь.*

**АРША́НСКІ КУЦЕ́ІНСКІ УСПЕ́НСКІ МАНАСТЫ́Р.** Існаваў у 17—20 ст. Заснаваны як жаночы манастыр у 1631 Багданам Сцянкевічам на паўд.-зах. ускраіне Оршы. У комплекс уваходзіла *некалькі драўляных цэркваў, жылыя і гасп. пабудовы. Гал. драўляны сабор* згарэў у *1635.* Пабудаваны мураваны Успенскі сабор (1655) меў рысы стылю барока. Крыжова-купальны 3-апсідны храм. Асн. неф і крылы трансепта былі накрыты ўзаемна перпендыкулярнымі 2-схільнымі дахамі з трохвугольнымі франтонамі на тарцах. Сяродкрыжжа ўвенчана 8-гранным глухім барабанам і масіўным грушападобным купалам з галоўкай. Сцены ўпрыгожаны прафіляванымі карнізамі, пілястрамі на вуглах. Высокія вокны з паўцыркульнымі арачнымі завяршэннямі. Франтоны завершаны галоўкамі і аздоблены патройнымі плоскімі арачнымі нішамі. У 1658 куцеінскія манахіні пераведзены ў новаадчынены Уваскрасенскі манастыр у Смаленску. Ёсць звесткі, што з Куцейна былі і першыя насельніцы Новадзявочага манастыра ў Маскве. У 1842 манастыр прылічаны да 1-га класа. Зачынены ў 1918, будынкі не захаваліся.

*Т.В.Габрусь, А.А.Яршэвіч.*

*Аршанскі Куцеінскі Успенскі манастыр. Агульны выгляд. Малюнак 19 ст.*

**АРША́НСКІ ЛЬНОКАМБІНА́Т.** Пабудаваны ў 1928—37 (1-я чарга) у Оршы. У 1963 уведзена 2-я, у 1972 — 3-я чарга. У 1973 у склад камбіната ўвайшла Аршанская льнопрадзільная ф-ка «Дняпро» (пастаўляе пражу дывановым прадпрыемствам Беларусі). З 1975 — ВА «Аршанскі льнокамбінат», з 1990 —

арэнднае вытворча-гандл. прадпрыемства. Асн. прадукцыя (1995): бытавыя (дэкаратыўныя, бялізнавыя, сукеначна-касцюмныя, кашульныя, на сурвэткі, абрусы, пакрывалы, ручнікі), тэхн. і тарныя тканіны. У 1994 выраблена 41 тыс. м² ільняных тканін (макс. выпуск 215 тыс. м² быў у 1989). Пры камбінаце тэхнікум і ПТВ тэкстыльшчыкаў.

**«АРША́НСКІ МАЛАДНЯ́К»**, літаратурна-мастацкі часопіс, які ў 1925—28 выдавала Аршанская філія *«Маладняка»*. Выйшла 7 нумароў. Змяшчаў вершы, лірычныя абразкі і апавяданні А.Вечара, М.Ганчарыка (вершы падпісваў псеўд. Я.Сявец), Ю.Гаўрука, В.Каваля, Т.Кляшторнага, М.Нікановіча, В.Сташэўскага, У.Прыбыткоўскага і інш. маладых пісьменнікаў, хроніку літ. жыцця Аршанскай акругі і маладнякоўскіх арг-цый рэспублікі.

**АРША́НСКІ МАНАСТЫ́Р БАЗЫЛЬЯ́Н**, помнік архітэктуры познята барока. Пабудаваны ў 2-й пал. 18 ст. з цэглы ў цэнтры Оршы на правым беразе р. Аршыца. У 1842 пераўтвораны ў праваслаўны мужчынскі Пакроўскі манастыр і духоўнае вучылішча. Складаўся з аб'яднаных у адзіны асіметрычны арх. комплекс касцёла Апекі Маці Божай (3-нефавая крыжова-купальная 2-вежавая базіліка; знішчаны ў 1967) і жылога корпуса. Жылы корпус — 2-павярховы Г-падобны ў плане будынак з вальмавым дахам. Фасады падзелены прамавугольнымі вокнамі і плоскімі нішамі, вязкамі пілястраў у прасценках, руставанымі лапаткамі, міжпаверхавымі цягамі. Абодва паверхі маюць галерэйную сістэму планіроўкі. *А.М.Кулагін.*

**АРША́НСКІ МЯСАКАНСЕ́РВАВЫ КАМБІНА́Т**. Пабудаваны ў 1928—30. У 1935 уведзены ў дзеянне кансервавы цэх. У Вял. Айч. вайну разбураны, пасля вайны адноўлены і рэканструяваны. Асн. прадукцыя (1995): мяса, каўбасныя вырабы, кансервы мясныя, тлушч харч. і тэхн., мясныя паўфабрыкаты, сухія кармы, субпрадукты.




Аўтар карты М.Ф.Спірыдонаў

**АРША́НСКІ НАСТА́ЎНІЦКІ ІНСТЫТУ́Т** імя Янкі Купалы. Існаваў у 1936—55 у Оршы. Імя Я.Купалы прысвоена ў 1941. Рыхтаваў настаўнікаў 5—7-х класаў для 7-гадовых і сярэдніх агульнаадук. школ. Тэрмін навучання 2 гады. Меў аддзяленні: фіз.-матэм., гіст. (да 1951), бел. і рус. мовы і л-ры, з 1944 падрыхтоўчае і завочнае. Працавалі кафедры: бел. і рус. мовы, бел. і рус. л-ры, педагогікі і псіхалогіі, фізікі і матэматыкі, марксізму-ленінізму. У Айч. вайну знішчаны навуч. корпус, інтэрнат, абсталяванне, бібліятэка. Аднавіў работу ў 1944. Закрыты ў сувязі з узбуйненнем пед. ВНУ.

**АРША́НСКІ ПАВЕ́Т**, адм.-тэр. адзінка на Беларусі ў 16—20 ст. Папярэднікам павета было Аршанскае (Рошскае) намесніцтва, утворанае ў 1392 вял. князем ВКЛ Вітаўтам. Верагодна, яно ўваходзіла ў Віцебскую зямлю і падзялялася на шэраг валасцей. У 15 — пач. 16 ст. значная іх частка падаравана буйным феадалам (Друцкім-Пуцяцічам, Друцкім-Бабічам, Адзінцэвічам, Гальшанскім і інш.). Назва А.п. (ці Аршанскае староства) ужывалася з 16 ст. Пасля ўключэння Смаленскай зямлі ў Маскоўскую дзяржаву А.п. стаў пагранічным і неаднойчы быў тэатрам ваен. дзеянняў. Паводле адм. рэформы ВКЛ 1565—66 у А.п. увайшлі Лукомскае і Друцкае княствы, Барысаўскае і Магілёўскае староствы, частка Аболецкага пав., Любашанская і ўсх. частка Свіслацкай валасцей і інш. А.п. ўваходзіў у *Віцебскае ваяводства*. Сцягам А.п. была харугва зялёнага колеру з выявай «Пагоні». У канцы 16 — 1-й пал. 17 ст. на тэр. павета сфарміравалася латыфундыя Сапегаў (частка Лукомскага і Друцкага княстваў, Аршанскае і Магілёўскае староствы і інш.). Буйнымі землеўладальнікамі былі кн. Галоўчынскія, Друцкія, Лукомскія, Сангушкі, Радзівілы, Хадкевічы і інш. Самыя вял. гарады ў 16—17 ст. Магілёў, Орша, Барысаў. У выніку 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) б.ч. павета (да р. Друць) адышла да Рас. імперыі, дзе была ўтворана Аршанская правінцыя, астатняя частка (з цэнтрам у Халопенічах) праіснавала да 2-га падзелу Рэчы Паспалітай (1793). У складзе Рас. імперыі А.п. з 1773 — адзін з трох паветаў *Аршанскай правінцыі*, з 1777 непасрэдна ў Магілёўскай губ., павялічаны за кошт скасаванага Дубровенскага пав. У 1796—1802 у Беларускай губ., павялічаны за кошт паўд. часткі скасаванага Бабінавіцкага пав., потым зноў у Магілёўскай губ. з аднаўленнем межаў 1777. У 1840 да А.п. далучаны паўторна скасаваны Бабінавіцкі пав., у 1861 — частка скасаванага Капыскага пав., частка А.п. на левым беразе Дняпра ўключана ў новаўтвораны Горацкі пав. З крас. 1919 у Гомельскай, з ліст. 1920 у Віцебскай губ. РСФСР. У сак. 1924 усх. частка А.п. ўключана ў Смаленскую губ., рэшта перададзена БССР, дзе 17.7.1924 А.п. скасаваны і замест яго ўтворана *Аршанская акруга*. *В.Л.Насевіч.*

**АРША́НСКІ РАЁН**, на ПдУ Віцебскай вобл. Беларусі. Утвораны 17.7.1924. Пл. 1,7 тыс. км². Нас. 44,8 тыс. чал. (1995), сярэдняя шчыльн. 26,4 чал./км², гарадскога 12%. Цэнтр — г. *Орша*; г. Барань, г.п. Арэхаўка і Копысь. 261 сельскі нас. пункт. 18 сельсаветаў: Браздзетчынскі, Веравайшанскі, Высокаўскі, Дубраўскі, Задроўеўскі, Зубаўскі, Клюкаўскі, Крапівенскі, Кудаеўскі, Ліпкаўскі, Малатынскі, Межаўскі, Панізоўскі, Першамайскі, Пішчалаўскі, Смалянскі, Стайкаўскі, Якаўлевіцкі.

Размешчаны ў межах *Аршанскага ўзвышша* і *Аршанска-Магілёўскай раўніны*. Паўночная ч. занята *Лучоскай нізінай*. Паверхня пераважна ўзгорыстая і платопадобная. Пераважаюць выш. 180—220 м, найвыш. пункт 237,5 м (на ПнЗ ад в. Стайкі). Карысныя выкапні: торф, даламіт, пясчана-жвіровы матэрыял, буд. пяскі, легкаплаўкія гліны. Сярэдняя т-ра студз. -7,8 °С, ліп. 18 °С. Ападкаў 627 мм за год. Вегетацыйны перыяд 184 дні. Рэкі: Дняпро з прытокамі Аршыца і Адроў (справа), Крапівенка і Лешча (злева). Гушчыня натуральнай рачной сеткі 0,43 км/км². Азёры: Вял. Арэхаўскае, Дзевінскае, Пераваловча, Кузьміно, Карэсіна. Пад лясамі 23% тэр. раёна, пераважаюць хваёвыя і яловыя, трапляюцца бярозавыя, асінавыя і альховыя.



Аўтар карт В.Л.Насевіч



Агульная пл. балотаў 4,2 тыс. га. Глебы с.-г. угоддзяў: дзярнова-падзолістыя (67,7%), дзярнова-падзолістыя забалочаныя (23,3%), дзярновыя і дзярнова-карбанатныя забалочаныя (3%), тарфяна-балотныя (3%), поймавыя (2,5%); паводле мех. складу — сугліністыя (84,9%), супясчаныя (11,4%), тарфяныя (3%), пясчаныя (0,7%).

Пад с.-г. ўгоддзямі 107 тыс. га, з іх асушаных 11,7 тыс. га. На 1.1.1995 у А.р. 23 калгасы і 10 саўгасаў. Развіты льнаводства, малочна-мясная жывёлагадоўля, свінаводства і птушкагадоўля. Вырошчваюць збожжавыя і кармавыя культуры, бульбу, агародніну. Прадпрыемствы па выт-сці буд. матэрыялаў (кафля, цэгла, жалезабетонныя вырабы), металаапрацоўцы (лёгкае машынабудаванне, станкабудаванне), лёгкай (тэкст., швейная), харч. прам-сці. Бел-ДРЭС. Здабыча торфу. Па тэр. раёна праходзяць чыгункі ад Оршы на Мінск, Магілёў, Крычаў, Віцебск, Лепель. Найб. значныя аўтадарогі Брэст—Масква і Магілёў—Віцебск. Магістральны газаправод Таржок—Мінск—Івацэвічы і нафтаправод на Наваполацк (адгалінаванне ад нафтаправода «Дружба»). У раёне Смалянскі саўгас-тэхнікум, Высокаўскае СПТУ, 26 сярэднеагульнаадук., 7 базавых, 11 пач. школ, 2 муз. школы, дзіцяча-юнацкая спарт. школа, 4 клубныя і 58 бібліятэчных устаноў, 6 бальніц, 28 фельч.-ак. пунктаў. *Купалаўскі мемарыяльны запаведнік «Ляўкі».* Архітэктурныя помнікі ў в. Смаляны: касцёл дамініканцаў (18 ст.), руіны замка (17 ст.), Спаса-Праабражэнская і Аляксееўская цэрквы (18 ст.). Помнікі прыроды — Высокаўскі і Межаўскі паркі. Выдаецца «Аршанская газета».

*С.І.Сідор.*

**АРША́НСКІ СТАДЫЯ́Л** (ад г. Орша), максімальны стадыял апошняга *паазерскага зледзянення* на Беларусі. Адбыўся 17,7—17 тыс. г. назад у час найб. развіцця ледавіковага покрыва, граніцы якога супадалі з паўд. мяжой *Беларускага Паазер'я.* Кліматычныя ўмовы былі самыя суровыя за ўсё зледзяненне. У краявой зоне сфарміраваліся марэнныя, водна-ледавіковыя, лёсападобныя і інш. адклады. Канцавыя марэнныя ўзвышшы (складзены пераважна з пясчана-жвіровага матэрыялу) цягнуцца ад Оршы на З да воз. Сялява, гарадоў Лепель, Докшыцы і воз. Нарач. На рэках бас. Дняпра і Нёмана ўтварыліся другія надпоймавыя тэрасы. Сфарміраваліся асн. рысы сучаснага рэльефу паўд. Паазер'я. На Пд ад мяжы А.с. намнажаліся покрыўныя лёсападобныя адклады (на Аршанска-Магілёўскай раўніне, Навагрудскім узв. і Мазырскай градзе).

*М.Я.Камароўскі.*

**АРША́НСКІ СТАНКАБУДАЎНІ́ЧЫ ЗАВО́Д.** Засн. ў 1900 у Оршы як слясарныя майстэрні. З 1915 мех. і жалезаліцейныя майстэрні, з 1928 чыгуна- і медналіцейны з-д (выпускаў вентылятары і запчасткі да с.-г. машын). З 1960 спецыялізуецца на выпуску плоскашліфавальных станкоў. Асвоіў вытв-сць высокапрадукцыйных плоскашліфавальных станкоў высокай дакладнасці для хуткага шліфавання і станкоў для эл.-хім. шліфавання. Прадукцыя адзначана залатымі медалямі на міжнар. выстаўках.

**АРШЫ́Н** (цюрк.), старажытная мера (адзінка) даўжыні. Карысталіся ў Афганістане, Балгарыі, Іране, Расіі (з 16 ст.), Турцыі («аршым»). Значэнне А. ў 16—18 ст. мянялася. На Беларусі ў 19 — пач. 20 ст. карысталіся рускім А. = 28 цалям = 16 вяршкам = 0,7112 м.

## АСНОЎНЫЯ СКАРАЧЭННІ, ПРЫНЯТЫЯ Ў БелЭн

### АГУЛЬНЫЯ СКАРАЧЭННІ

ААН — Арганізацыя Аб'яднаных Нацый
абл. — абласны
абс. — абсалютны
абх. — абхазскі
авіяц. — авіяцыйны
агр. — аграрны
агульнаадук. — агульнаадукацыйны
адб. — адбітак
аддз. — аддзяленне
аддз. — аддзел (у бібліяграфіі)
аддз-не — аддзяленне (у бібліяграфіі)
адж. — аджарскі
адз. л. — адзіночны лік (грам.)
адм. — адміністрацыйны; адмірал (пры імю)
адм.-гасп. — адміністрацыйна-гаспадарчы
адм.-тэр. — адміністрацыйна-тэрытарыяльны
адм. ц. — адміністрацыйны цэнтр
аднайм. — аднайменны

АДПУ — Аб'яднанае дзяржаўнае палітычнае ўпраўленне
адукац. — адукацыйны
азб. — азбеставы
азерб. — азербайджанскі
айч. — айчынны
Айч. вайна — Айчынная вайна
ак. — акіян
акад. — акадэмічны; акадэмік (пры імю)
акр. — акруговы; акруга (пры назве)
акупац. — акупацыйны
акц. — акцыянерны
алб. — албанскі
алг. — алгебраічны
алж. — алжырскі
алімп. — алімпійскі
алюм. — алюмініевы
АМ — Акадэмія мастацтваў
амер. — амерыканскі
АМН — Акадэмія медыцынскіх навук
АМРР — Асацыяцыя мастакоў рэвалюцыйнай Расіі
АН — Акадэмія навук
аналіт. — аналітычны
анат. — анатамічны
англ. — англійскі
ант. — антычны
антаган. — антаганістычны
антрапал. — антрапалагічны
антырэліг. — антырэлігійны
апавяд. — апавядальны; апавяданне (пры назве)
апазіц. — апазіцыйны
АПК — аграпрамысловы комплекс
АПН — Акадэмія педагагічных навук
апр. — апрацоўка (муз.)
аптыміст. — аптымістычны
апубл. — апублікаваны
араб. — арабскі
арг. — аргенцінскі
арган. — арганічны
арганізац. — арганізацыйны
арг-цыя — арганізацыя
арк. — аркестравы
арм. — армянскі
арт. — артыкул (пры назве); артыст (пры імю); у бібліяграфіі
артыл. — артылерыйскі
арх. — архітэктурны; архітэктар (пры імю)
археагр. — археаграфічны
археал. — археалагічны
арыфм. — арыфметычны
асв. — асветны
АСЕАН — афіцыйная назва Асацыяцыі эканамічнага і культурнага супрацоўніцтва краін Паўднёва-Усходняй Азіі
АСК — аўтаматычная сістэма кіравання
аскет. — аскетычны
асн. — асноўны
астр. — астранамічны
ат. м. — атамная маса
ат. н. — атамны нумар

атл. — атлантычны
атм. — атмасферны
атр. — атрад (у біялогіі)
АТС — аўтаматычная тэлефонная станцыя
атэіст. — атэістычны
аўт. — аўтаномны
аўтабіягр. — аўтабіяграфічны
аўтам. — аўтаматычны
аўтамаб. — аўтамабільны
аўстр. — аўстрыйскі
аўстрал. — аўстралійскі
афг. — афганскі
афіц. — афіцыйны
афр. — афрыканскі
АЭС — атамная электрастанцыя
б. — былы (пры назве)
Б. Усход — Блізкі Усход
бактэрыял. — бактэрыялагічны
балг. — балгарскі
балетм. — балетмайстар (пры імю)
балк. — балканскі
балт. — балтыйскі
БАН — Беларуская акадэмія навук
бас. — басейн
бат. — батанічны
башк. — башкірскі
БВА — Беларуская ваенная акруга
Б.г. — без году (у бібліяграфіі)
БДА — Беларускі дзяржаўны архіў
БДАМЛіМ — Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва
БДГА — Беларускі дзяржаўны гістарычны архіў
БДУ — Беларускі дзяржаўны універсітэт
бел. — беларускі
белагв. — белагвардзейскі
бельг. — бельгійскі
бібліягр. — бібліяграфічны
біягр. — біяграфічны
біял. — біялагічны
б-ка — бібліятэка
БНР — Беларуская Народная Рэспубліка
БНФ — Беларускі народны фронт
Б.м. — без месца (у бібліяграфіі)
БПА — Беларуская політэхнічная акадэмія
БПІ — Беларускі політэхнічны інстытут
браз. — бразільскі
бронз. — бронзавы
брыт. — брытанскі
БСГ — Беларуская сацыялістычная грамада
БСГА — Беларуская сельскагаспадарчая акадэмія
БСДП — Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя
БСРГ — Беларуская сялянска-работніцкая грамада
БССР — Беларуская ССР
буд. — будаўнічы
буд-ва — будаўніцтва
буйн. раг. жывёла — буйная рагатая жывёла
бур. — бурацкі
бурж. — буржуазны
б.ч. — большая частка
БШПР — Беларускі штаб партызанскага руху
быт. — бытавы
В. — Вялікі (у назве)
в. — вёска (пры назве)
ВА — вытворчае аб'яднанне
ВАГ — ваенна-аператыўная група
вадасх. — вадасховішча
ваен. — ваенны
вайск. — вайсковы
вак. — вакальны
в-аў — востраў
ваяв. — ваяводства (пры назве)
ВДНГ — Выстаўка дасягненняў народнай гаспадаркі
вегетац. — вегетацыйны
венг. — венгерскі

вер. — верасень
верас. — верасень (у бібліяграфіі)
верт. — вертыкальны
вет. — ветэрынарны
в'етн. — в'етнамскі
візант. — візантыйскі
ВКЛ — Вялікае княства Літоўскае
ВКП(б) — Усесаюзная Камуністычная партыя (бальшавікоў)
ВЛКСМ — Усесаюзны Ленінскі Камуністычны саюз моладзі
ВМС — ваенна-марскія сілы
ВМФ — ваенна-марскі флот
ВНУ — вышэйшая навучальная ўстанова
вобл. — вобласць (пры назве)
воз. — возера (пры назве)
вол. — воласць (пры назве)
ВПС — ваенна-паветраныя сілы
ВРК — ваенна-рэвалюцыйны камітэт
ВСНГ — Вышэйшы савет народнай гаспадаркі
вуч. — вучылішча (пры назве)
ВЦВК — Усерасійскі Цэнтральны Выканаўчы камітэт
ВЦСПС — Усесаюзны Цэнтральны Савет Прафесійных Саюзаў
ВЧ — высокая частата, высокачастотны
ВЧК — Усерасійская надзвычайная камісія па барацьбе з контррэвалюцыяй і сабатажам
выбр. — выбраны
выд. — выданне
выд-ва — выдавецтва
вызв. — вызваленчы
выліч. — вылічальны
вып. — выпуск
вытв. — вытворчы
вытв-сць — вытворчасць
выш. — вышыня
выяўл. — выяўленчы
вял. — вялікі
Вял. Айч. вайна — Вялікая Айчынная вайна
Вял. кн. Літ. — Вялікае княства Літоўскае
вярх. — вярхоўны
Вярх. Савет — Вярхоўны Савет
г. — горад; гара (пры назвах); гады
газ. — газета (пры назве)
гал. — галоўны
гандл. — гандлёвы

гар. — гарадскі
гарыз. — гарызантальны
гасп. — гаспадарчы
гв., гвардз. — гвардзейскі
гг. — гады́ (у бібліяграфіі)
ГДК — гранічна дапушчальная канцэнтрацыя
геагр. — геаграфічны
геад. — геадэзічны
геал. — геалагічны
геам. — геаметрычны
геафіз. — геафізічны
геахім. — геахімічны
ген. — генеральны; генерал (пры імю)
ген.-лейт. — генерал-лейтэнант (пры імю)
ген.-м. — генерал-маёр (пры імю)
ген.-палк. — генерал-палкоўнік (пры імю)
генет. — генетычны
герм. — германскі
Герой Сав. Саюза — Герой Савецкага Саюза
Герой Сац. Працы — Герой Сацыялістычнай Працы
гідрамеліярац. — гідрамеліярацыйны
гідраўл. — гідраўлічны
гіст. — гістарычны
гл. — глядзі
глыб. — глыбіня
г.н. невяд. — год нараджэння невядомы
горназдаб. — горназдабыўны
г.п. — гарадскі пасёлак; пасёлак гарадскога тыпу
гр. — група (хім.)
грамадз. — грамадзянскі
грамат. — граматычны
груз. — грузінскі
грэч. — грэчаскі
губ. — губерня (пры назве), губернскі
гуманіст. — гуманістычны
гуманіт. — гуманітарны
ГЭС — гідраэлектрастанцыя
Д. Усход — Далёкі Усход
давед. — даведнік (у бібліяграфіі)
даг. — дагестанскі
дакумент. — дакументальны
дарэв. — дарэвалюцыйны
даўж. — даўжыня
дац. — дацэнт
дзес. — дзесяціна
дзярж. — дзяржаўны
докл. — даклады (у бібліяграфіі)
дол. — долар
д-р — доктар
д-р н. — доктар навук
драм. — драматычны
драматург. — драматургічны
дрэваапр. — дрэваапрацоўчы
ДРЭС — дзяржаўная раённая электрастанцыя
дыв. — дывізія
дыпламат. — дыпламатычны
дыялект. — дыялектычны
дэкар. — дэкаратыўны
дэмакр. — дэмакратычны
дэп. — дэпутат
дэп. Вярх. Савета — дэпутат Вярхоўнага Савета
егіп. — егіпецкі
ЕС — Еўрапейскае супольніцтва
еўрап. — еўрапейскі
ж. — жыхар
жал. — жалезны
жан. — жаночы
жн. — жнівень
ж.р. — жаночы род (грам.)
жыл. — жыллёвы
З — захад (напрамак свету)
заал. — заалагічны
заг. — загадчык
заканад. — заканадаўчы
зап. — запіскі (у бібліяграфіі)
засл. — заслужаны
засл. арт. — заслужаны артыст
засл. дз. культ. — заслужаны дзеяч культуры
засл. дз. маст. — заслужаны дзеяч мастацтва
засл. дз. нав. — заслужаны дзеяч навукі
засл. дз. нав. і тэхн. — заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі
засл. работнік культ. — заслужаны работнік культуры
засн. — заснаваны
зах. — заходні
зах.-бел. — заходнебеларускі
зах. д. — заходняя даўгата
зб. — зборнік (пры назве); збор (у бібліяграфіі)
зб-кі — зборнікі (пры назве)
ЗВЧ — звышвысокая частата, звышвысокачастотны
з-д — завод
і г.д. — і гэтак далей
избр. произв. — избранные произведения
і пад. — і падобныя
ідэалаг. — ідэалагічны
ідэаліст. — ідэалістычны
іл. — ілюстрацыя
ільноапр. — ільноапрацоўчы
імперыял. — імперыялістычны
імправіз. — імправізаваны
ІМЭФ — Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору
інд. — індыйскі
інданез. — інданезійскі
індустр. — індустрыяльны
індывід. — індывідуальны
інж. — інжынерны; інжынер (пры імю)
інстр. — інструментальны
ін-т — інстытут
інтэрнац. — інтэрнацыянальны
інфарм. — інфармацыйны
інфекц. — інфекцыйны
інш. — іншыя
ірл. — ірландскі
ісп. — іспанскі
італ. — італьянскі (у бібліяграфіі)
італьян. — італьянскі
каап. — кааператыўны
каб.-балк. — кабардзіна-балкарскі
кав. — кавалерыйскі
каз. — казахскі
калан. — каланіяльны
калг. — калгасны; калгас (пры назве)
калект. — калектыўны
калм. — калмыцкі
каманд. — камандуючы
камб. — камбінаваны
кам.-вуг. — каменнавугальны
камед. — камедыйны
камуніст. — камуністычны
кан. — канадскі
канд. — кандыдат
канстр. — канструкцыйны
кантынент. — кантынентальны
канф. — канферэнцыя (у бібліяграфіі)
канфер. — канферэнцыя
капіталіст. — капіталістычны
кар. — карэйскі
каракалп. — каракалпакскі
касм. — касмічны
кастр. — кастрычнік; кастрычніцкі
кат. — каталог
каўк. — каўказскі
каэф. — каэфіцыент
КБ — канструктарскае бюро
КДБ — Камітэт дзяржаўнай бяспекі
КЗаП — Кодэкс законаў аб працы
кірг. — кіргізскі
кіт. — кітайскі
КК — Крымінальны кодэкс
ккдз — каэфіцыент карыснага дзеяння
кл. — клас
кн. — кніга (пры назве); князь (пры імю)
К° — кампанія
контррэв. — контррэвалюцыйны
КПБ — Камуністычная партыя Беларусі
КП(б)Б — Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі
КПЗБ — Камуністычная партыя Заходняй Беларусі
КПК — Крымінальна-працэсуальны кодэкс
КПСС — Камуністычная партыя Савецкага Саюза
кр. — крыніцы (у бібліяграфіі)
крас. — красавік; красавіцкі
крымін. — крымінальны
крышт. — крышталічны
к-т — камітэт
к-та — кіслата
культ. — культурны
культ.-асв. — культурна-асветны
Л. — Ленінград (у бібліяграфіі)
лат. — латышскі
латв. — латвійскі
лац. — лацінскі
лац.-амер. — лацінаамерыканскі
лек. — лекавы
лесаапр. — лесаапрацоўчы
лесапрам. — лесапрамысловы
ЛіБ — Літва і Беларусь
ЛіМ — «Літаратура і мастацтва»
ліп. — ліпень
ліст. — лістапад; лістападаўскі
лістап. — лістапад (у бібліяграфіі)
літ. — літаратуры; літаратура (у бібліяграфіі); літоўскі
літар. — літаральна
літ.-знавец — літаратуразнавец
літ.-знаўства — літаратуразнаўства
л-ра — літаратура
ЛЭП — лінія электраперадачы
лют. — люты (у бібліяграфіі)
Люг. рэв. — Лютаўская рэвалюцыя
м. — мыс; мора
М. — Малы (пры назве); Масква (у бібліяграфіі)
магн. — магнітны
макед. — македонскі
макс. — максімальны
малд. — малдаўскі
манапал. — манапалістычны
манарх. — манархічны
манг. — мангольскі
манум. — манументальны
марфал. — марфалагічны
маст. — мастацкі; мастак (пры імю)
мат.-тэхн. — матэрыяльна-тэхнічны
мат.-тэхн. забесп. — матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне
матэм. — матэматычны
маш.-буд. — машынабудаўнічы
матэрыяліст. — матэрыялістычны
мед. — медыцынскі
мекс. — мексіканскі
меліярац. — меліярацыйны
метал. — металічны
металаапр. — металаапрацоўчы
метафіз. — метафізічны
мех. — механічны
механіст. — механістычны
МЖС — машынна-жывёлагадоўчая станцыя
МЗС — Міністэрства замежных спраў
міжнар. — міжнародны
мікрабіял. — мікрабіялагічны
мілітар. — мілітарысцкі
мін. — мінорны; міністр (пры імю)
мін-ва — міністэрства
мінер. — мінеральны
мінім. — мінімальны
М.; Л. — Масква — Ленінград (у бібліяграфіі)
млн. — мільён
млрд. — мільярд
ММС — машынна-меліярацыйная станцыя
Мн. — Мінск (у бібліяграфіі)
мн. л. — множны лік (грам.)
м. р. — мужчынскі род (грам.)
МСАП — Міжнародны саюз аховы прыроды
МТС — машынна-трактарная станцыя
муз. — музычны

МУС — Міністэрства ўнутраных спраў
мусульм. — мусульманскі
мяса-мал. — мяса-малочны
мяст. — мястэчка (пры назве)
мясц. — мясцовы
н. — нарадзіўся
н. р. — ніякі род (грам.)
н.ст. — новы стыль
н.э. — наша эра
навук. — навуковы
навуч. — навучальны
надрук. — надрукавана
найб. — найбольшы, найбольш
найважн. — найважнейшы
найвыш. — найвышэйшы
наз. — называецца
нам. — намеснік
нап. — напісана
напр. — напрыклад
нар. — народны
НАРБ — Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь
нар. гасп. — народная гаспадарка
нар.-гасп. — народнагаспадарчы
нарв. — нарвежскі
нас. — насельніцтва
НАСА — Нацыянальнае кіраўніцтва па аэранаўтыцы і даследаванні касмічнай прасторы (ЗША)
наст. — наступны
НАТО — афіцыйная назва ваенна-палітычнага саюза, створанага на аснове Паўночнаатлантычнага пакта
нафтапераг. — нафтаперагонны
нафтаперапр. — нафтаперапрацоўчы
нац. — нацыянальны
нац.-вызв. — нацыянальна-вызваленчы
нацыяналіст. — нацыяналістычны
нач. — начальнік
НВА — навукова-вытворчае аб'яднанне
н.-д. — навукова-даследчы
НДІ — навукова-даследчы інстытут
нерв. — нервовы
нерж. — нержавейны
нідэрл. — нідэрландскі
НКДБ — Народны камісарыят дзяржаўнай бяспекі
НКУС — Народны камісарыят унутраных спраў
новазел. — новазеландскі
НЧ — нізкая частата, нізкачастотны
ням. — нямецкі
ням.-фаш. — нямецка-фашысцкі
отд. — отдел (у бібліяграфіі)
отд-ние — отделение (у бібліяграфіі)
п. — памёр
Пб. — Пецярбург (у бібліяграфіі)
Пг. — Петраград (у бібліяграфіі)
рН — вадародны паказчык
пав. — павет (пры назве); павятовы
паветр. — паветраны
пагран. — пагранічны
пад каманд. — пад камандаваннем
падатр. — падатрад
падп. — падпольны
падсям. — падсямейства
пал. — палавіна
паліграф. — паліграфічны
палінез. — палінезійскі
паліт. — палітычны
палк. — палкоўнік (пры імю)
пам. — памочнік
параўн. — параўнанне; пара́ўнай
парт. — партыйны
партуг. — партугальскі
партыз. — партызанскі
пас. — пасёлак (пры назве)
пасаж. — пасажырскі
паст. — пастаноўка; пастанова
паталаг. — паталагічны
патрыят. — патрыятычны
паўд. — паўднёвы
паўд. ш. — паўднёвая шырата
паўн. — паўночны
паўн. ш. — паўночная шырата
паўн.-асец. — паўночнаасецінскі
п-аў — паўвостраў
пач. — пачатак; пачатковы
пашыр. — пашырана
паэт. — паэтычны
Пд — поўдзень
ПдЗ — паўднёвы захад
ПдУ — паўднёвы ўсход
пед. — педагагічны
пер. — пераклад, перакладчык
перс. — персідскі
перыяд. — перыядычны
пецярб. — пецярбургскі
пл. — плошча
плем. — племянны
ПМК — перасоўная механізаваная калона
Пн — поўнач
ПнЗ — паўночны захад
ПнУ — паўночны ўсход
політэхн. — політэхнічны
Полн. собр. соч. — Полное собрание сочинений (у бібліяграфіі)
ППА — проціпаветраная абарона
ППХА — проціпаветраная і проціхімічная ахова
пр. — працы (у бібліяграфіі)
прав. — правінцыя
правадз. (чл.) — правадзейны (член)
правасл. — праваслаўны
прагрэс. — прагрэсіўны
прадукц. — прадукцыйны
пралет. — пралетарскі
прамысл. — прамысловы
прам-сць — прамысловасць
праф. — прафесар
прафес. — прафесійны
прафілакт. — прафілактычны
прафс. — прафсаюзны
прац. — працоўны
прыбл. — прыблізна
псеўд. — псеўданім
псіхал. — псіхалагічны
ПСРЛ — Поўны збор рускіх летапісаў
ПТВ — прафесійна-тэхнічнае вучылішча
публ. — публікацыя (у бібліяграфіі)
пях. — пяхотны
р. — рака (пры назве)
р.п. — рабочы пасёлак
р.ц. — раённы цэнтр
развед. — разведвальны
раздз. — раздзел
рамант. — рамантычны
рас. — расійскі
р-н — раён (пры назве)
РВС — рэўваенсавет
РСДРП — Расійская сацыял-дэмакратычная рабочая партыя
РСЧА — Рабоча-сялянская Чырвоная Армія
РТС — рамонтна-тэхнічная станцыя
руб. — рубель
рум. — румынскі
рус. — рускі
рым. — рымскі
рыс. — рысунак
рэакц. — рэакцыйны
рэаліст. — рэалістычны
рэв. — рэвалюцыйны
рэвіз. — рэвізійны
рэд. — рэдактар (пры імю); рэдакцыя; рэдакцыйны
рэж. — рэжысёр (пры імю)
рэліг. — рэлігійны
рэсп. — рэспубліканскі
с. — старонка; сяло (пры назве)
сав. — савецкі
Сав. Армія — Савецкая Армія
сак. — сакавік
самадз. — самадзейны
самаст. — самастойны
сан. — санітарны
санскр. — санскрыцкі
сапр. — сапраўдны; сапраўды
сатыр. — сатырычны
сац. — сацыяльны
сацыяліст. — сацыялістычны
сб. ст. — сборник статей (у бібліяграфіі)
с. в. — светлавое выпрамяненне
св. — святы
с.-г. — сельскагаспадарчы
с.-д. — сацыял-дэмакратычны
СЕАТО — афіцыйная назва ваеннага блока, створанага на аснове дагавору пра калектыўную абарону ў Паўднёва-Усходняй Азіі
СЕНТО — афіцыйная назва ваеннага блока, створанага на аснове «Багдадскага пакта»
СІ — Міжнародная сістэма адзінак
сіб. — сібірскі
сім. — сіметрычны
сімф. — сімфанічны; сімфонія (пры назве)
сінт. — сінтэтычны
сінтакс. — сінтаксічны
сістэм. — сістэматычны
сканд. — скандынаўскі
СКБ — спецыяльнае канструктарскае бюро
скл. — скланенне; скліканне
склад. — складальнік (у бібліяграфіі)
скульпт. — скульптурны; скульптура; скульптар (пры імю)
слав. — славянскі
СМ — Савет Міністраў
снеж. — снежань; снежаньскі
СНК — Савет Народных Камісараў
Собр. соч. — Собрание сочинений (у бібліяграфіі)
сост. — составитель (у бібліяграфіі)
Соч. — Сочинения (у бібліяграфіі)
спарт. — спартыўны
Спб. — Санкт-Пецярбург (у бібліяграфіі)
спец. — спецыяльны
СССР — Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік
с/с — сельсавет (пры назве)
с. ст. — стары стыль
ст. — стагоддзе; стагоддзі; станцыя (пры назве)
Стараж. — Старажытны (у назвах: Старажытны Рым, Старажытная Русь і пад.)
стараж. — старажытны
стараслав. — стараславянскі
статыст. — статыстычны
стр. — струнны
стралк. — стралковы
стратэг. — стратэгічны
студз. — студзень
суд. — судовы
сусв. — сусветны
сухап. — сухапутны
СФП — Сусветная Федэрацыя прафсаюзаў
сх. — схема
схаласт. — схаластычны
сял. — сялянскі
сям. — сямейства (у біялогіі)
сцэн. — сцэнічны
т. — том
t, т-ра — тэмпература
$t_{кіп}$ — тэмпература кіпення
$t_{пл}$ — тэмпература плаўлення
табл. — табліца
тадж. — таджыкскі
танк. — танкавы
танц. — танцавальны
тапагр. — тапаграфічны
ТАСС — Тэлеграфнае агенцтва Савецкага Саюза
тат. — татарскі
ТБМ — Таварыства беларускай мовы
ТБШ — Таварыства беларускай школы
тв. — творы
т-ва — таварыства
т. зв. — так званы
тр. — труды (у бібліяграфіі)
т-р — тэатр

традыц. — традыцыйны
ТРАМ — тэатр рабочай моладзі
трансп. — транспартны
трыкат. — трыкатажны
туб. — туберкулёзны
тув. — тувінскі
тур. — турэцкі
туркм. — туркменскі
т.ч. — такім чынам
тыс. (ж.) — тысяча (жыхароў); тысячагоддзе (пры лічбе)
тэарэт. — тэарэтычны
тэатр. — тэатральны
тэкст. — тэкстыльны
тэлегр. — тэлеграфны
тэлеф. — тэлефонны
тэр. — тэрыторыя; тэрытарыяльны
тэрапеўт. — тэрапеўтычны
тэрарыст. — тэрарыстычны
тэхн. — тэхнічны
тэхнал. — тэхналагічны
У — усход
УАСГНІЛ — Усесаюзная акадэмія сельскагаспадарчых навук імя У.І. Леніна
УВЧ — ультравысокія частоты
удз. в. — удзельная вага
удм. — удмурцкі
узб. — узбекскі
узбр. — узброены
узв. — узвышша (пры назве)
узнаг. — узнагароджаны
узр. м. — узровень мора
укл. — уключна; уклейка
уклад. — укладальнік (у бібліяграфіі)
УКП — Усеагульная канфедэрацыя працы
укр. — украінскі
УКХ — ультракароткія хвалі
унутр. — унутраны
ун-т — універсітэт

ураўн. — ураўненне
усерас. — усерасійскі
усх. — усходні
усх. д. — усходняя даўгата
у т. л. — у тым ліку
у. х. — ударная хваля
фабр. — фабрычны
фабр.-зав. — фабрычна-заводскі
факс. выд. — факсімільнае выданне (у бібліяграфіі)
фалькл. — фальклорны
фанет. — фанетычны
фантаст. — фантастычны
фармаліст. — фармалістычны
фатагр. — фатаграфічны
фаш. — фашысцкі
феад. — феадальны
фельч.-ак. — фельчарска-акушэрскі
фіз. — фізічны
фіз.-матэм. — фізіка-матэматычны
фіз.-хім. — фізіка-хімічны
фізіял. — фізіялагічны
філал. — філалагічны
філас. — філасофскі
фін. — фінансавы; фінскі
фінл. — фінляндскі
ф-ка — фабрыка
ф-ла — формула
флам. — фламандскі
фп. — фартэпіяна
фр. — французскі (у бібліяграфіі)
франц. — французскі
ФРГ — Федэратыўная Рэспубліка Германія
ф. ст. — фунт стэрлінгаў
ф-т — факультэт
функцыян. — функцыянальны
хар. — харавы
харч. — харчовы
хім. — хімічны
хірург. — хірургічны
хім.-тэрм. — хіміка-тэрмічны
хр. — хрыбет (пры назве)
хранік. — хранікальны
хрысц. — хрысціянскі
царк. — царкоўны
ЦБ — Цэнтральнае бюро
цв. — цвёрдасць
ЦВК — Цэнтральны выканаўчы камітэт
ЦК — Цэнтральны камітэт
ЦКК — Цэнтральная кантрольная камісія
ц. н. с. — цэнтральная нервовая сістэма
ЦО — Цэнтральны орган
цукр. — цукровы
ЦШПР — Цэнтральны штаб партызанскага руху
цэм. — цэментавы
цэнтр. — цэнтральны
ЦЭС — цеплаэлектрастанцыя
ЦЭЦ — цеплаэлектрацэнтраль
цюрк. — цюркскі
ч. — частка
чал. — чалавек (пры лічбе)
час. — часопіс (пры назве)
часоп. — часопіс (у бібліяграфіі)
ЧК — надзвычайная камісія
чл. — член
чл.-кар. — член-карэспандэнт
чув. — чувашскі
чыг. — чыгунка (пры назве); чыгуначны
чыг.-ліц. — чыгуналіцейны
чыг.-плав. — чыгунаплавільны
чыг. ст. — чыгуначная станцыя
чырв. — чырвоны
Чырв. Армія — Чырвоная Армія
чэрв. — чэрвень; чэрвеньскі
чэч.-інг. — чэчэна-інгушскі
чэш. — чэшскі
шатл. — шатландскі
швед. — шведскі
швейц. — швейцарскі
шматнац. — шматнацыянальны
ШСЗ — штучны спадарожнік Зямлі
шт. — штука
шчыльн. — шчыльнасць
шыр. — шырыня
эвалюц. — эвалюцыйны
ЭВМ — электронная вылічальная машына
эканам. — эканамічны
экз. — экзэмпляр
эксперым. — эксперыментальны
эл. — электрычны
эл.-магн. — электрамагнітны
энергет. — энергетычны
энцыкл. — энцыклапедыя, энцыклапедычны (у бібліяграфіі)
эпідэміял. — эпідэміялагічны
эрс — электрарухальная сіла
эст. — эстонскі
эстр. — эстрадны
эстэт. — эстэтычны
этн. — этнічны
этнагр. — этнаграфічны
югасл. — югаслаўскі
ЮНЕСКА — установа ААН па пытаннях асветы, навукі і культуры
юрыд. — юрыдычны
ядз. — ядзерны
як. — якуцкі
які-н. — які-небудзь
яп. — японскі
яўр. — яўрэйскі

## СКАРОЧАНЫЯ АБАЗНАЧЭННІ АДЗІНАК ФІЗІЧНЫХ ВЕЛІЧЫНЯЎ

А — ампер
а.а. — астранамічная адзінка
а.а.м. — атамная адзінка масы
аб/мін — абарот за мінуту
аб/с — абарот за секунду
Б — бел
Бк — бекерэль
В — вольт
Вб — вебер
Вт — ват
г. — год
г — грам
га — гектар
гадз — гадзіна
Гн — генры
$^{\circ}$ — градус вуглавы
°С — градус Цэльсія
°R — градус Рэамюра
°F — градус Фарэнгейта
Гр — грэй
Гц — герц
Дж — джоўль
Зв — зіверт
К — кельвін
кар — карат
кВ — кілавольт
кВт — кілават
кг — кілаграм
кГц — кілагерц
кДж — кіладжоўль
Кі — кюры
Кл — кулон
км — кіламетр
км$^2$ — квадратны кіламетр
км$^3$ — кубічны кіламетр
км/гадз — кіламетр за гадзіну
км/с — кіламетр за секунду
к.с. — конская сіла
кэВ — кілаэлектронвольт
л — літр
лк — люке
лм — люмен
м — метр
м$^2$ — квадратны метр
м$^3$ — кубічны метр
мА — міліампер
мВ — мілівольт
мВт — міліват
мг — міліграм
м/гадз — метр за гадзіну
МГц — мегагерц
мін — мінута
$'$ — мінута вуглавая
мкА — мікраампер
мкВ — мікравольт
мкФ — мікрафарад
мм — міліметр
мм$^2$ — квадратны міліметр
мм$^3$ — кубічны міліметр
мм рт. сл. — міліметр ртутнага слупа
м/с — метр за секунду
МэВ — мегаэлектронвольт
Н — ньютан
Ом — ом
Па — паскаль
пк — парсек
Р — рэнтген
с — секунда
$''$ — секунда вуглавая
св. год — светлавы год
см — сантыметр
см$^2$ — квадратны сантыметр
см$^3$ — кубічны сантыметр
ст. — стагоддзе
сут — суткі
т — тона
Тл — тэсла
тыдз — тыдзень
Ф — фарад
ц — цэнтнер
ц/га — цэнтнер на гектар (з гектара)
эВ — электронвольт

# АСНОЎНЫЯ ЎМОЎНЫЯ АБАЗНАЧЭННІ НА КАРТАХ

## НАСЕЛЕНЫЯ ПУНКТЫ

| | |
|---|---|
| МІНСК | больш за 1 000 000 жыхароў |
| ТУНІС | ад 500 000 да 1 000 000 жыхароў |
| БАТУМІ | ад 100 000 да 500 000 жыхароў |
| Дурэс | ад 50 000 да 100 000 жыхароў |
| Зея | ад 10 000 да 50 000 жыхароў |
| а) Азарычы<br>б) *Парэчча* | менш за 10 000 жыхароў (а–гарадскія, б–сельскія) |

Падкрэсліваннем назваў вылучаны:

| | |
|---|---|
| | сталіцы дзяржаў |
| | цэнтры ўладанняў |
| | сталіцы рэспублік, цэнтры краёў, абласцей і іншых адміністрацыйных адзінак |
| | цэнтры раёнаў Беларусі, аўтаномных акруг |

## ГРАНІЦЫ (МЕЖЫ)

| | |
|---|---|
| | дзяржаўныя |
| | палярных уладанняў Расіі |
| | рэспублік, краёў, абласцей і іншых адміністрацыйных адзінак |
| | раёнаў Беларусі, аўтаномных акруг |
| | Дэмаркацыйная лінія паміж Індыяй і Пакістанам у Кашміры, паміж КНДР і Рэспублікай Карэя |

## ШЛЯХІ ЗНОСІН

| | |
|---|---|
| | Чыгункі |
| | Аўтамабільныя дарогі, перавалы |
| | Парты |

## ІНШЫЯ ЎМОЎНЫЯ АБАЗНАЧЭННІ

| | |
|---|---|
| | Азёры прэсныя |
| | Азёры салёныя |
| | Азёры часовыя |
| | Балоты |
| | Саланчакі |
| | Рэкі пастаянныя |
| | Рэкі, якія перасыхаюць |
| | Сухія рэчышчы |
| | Парогі і вадаспады |
| | Каналы меліярацыйныя |
| | Вечны снег і ледавікі |
| | Лававыя палі |
| | Пяскі |
| | Наралавыя рыфы |
| ▲ | Дзеючыя вулканы |
| *3353* | Адзнакі вышынь над узроўнем мора |
| 2340 | Адзнакі глыбінь |
| | Марскія цячэнні |
| | а) цёплыя б) халодныя |

Заўвагі: 1. Адміністрацыйныя адзінкі аднайменныя з назвамі іх цэнтраў на картах не падпісаны.

2. Умоўныя абазначэнні, змешчаныя ў легендах асобных картаў, у гэту табліцу не ўключаны.

## СКАРАЧЭННІ, ПРЫНЯТЫЯ НА КАРТАХ

| | | | |
|---|---|---|---|
| АКР. | акруга | *м.* | мыс |
| арх. | архіпелаг | *Ніж.* | ніжні |
| а-вы. | астравы | *НІЗ.* | нізіна |
| ат. | атол | *Нов.* | новы |
| АА | аўтаномная акруга | ПАВ. | павет |
| АВ | аўтаномная вобласць | пар. | парог |
| бал. | балота | п-аў | паўвостраў |
| бас. | басейн | пд. ш. | паўднёвая шырата |
| бух. | бухта | Паўд. | паўднёвы |
| вдсп. | вадаспад | пн. ш. | паўночная шырата |
| вдсх. | вадасховішча | Паўн. | паўночны |
| ВАЯВ. | ваяводства | *пер.* | перавал |
| *Верх.* | верхні | прал. | праліў |
| ВОБЛ. | вобласць | пр. | праход |
| воз. | возера | р-н | раён |
| в. | востраў | РЭСП. | рэспубліка |
| *влк.* | вулкан | Св. | святы |
| *Вял.* | вялікі | спрэчн. | спрэчная |
| гав. | гавань | *Стар.* | стары |
| *г.* | гара | *Сярэд.* | сярэдні |
| ГУБ. | губерня | ТЭР. | тэрыторыя |
| зал. | заліў | *УЗВ.* | узвышша |
| *Зах.* | заходні | *УПАДЗ.* | упадзіна |
| з. д. | заходняя даўгата | *Усх.* | усходні |
| кан. | канал | у. д. | усходняя даўгата |
| *Кр.* | красны | *ХР.* | хрыбет |
| лед. | ледавік | ЦЭНТР. | цэнтральны |
| лім. | ліман | *Чыр.* | чырвоны |
| *Мал.* | малы | шэльф. | шэльфавы |

**СУПРАЦОЎНІКІ ВЫДАВЕЦТВА «БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ», ЯКІЯ ПРЫМАЛІ ЎДЗЕЛ У ПАДРЫХТОЎЦЫ І ВЫДАННІ 1-га ТОМА БЕЛАРУСКАЙ ЭНЦЫКЛАПЕДЫІ**

**Галоўная рэдакцыя**
Галоўны рэдактар — Г.П.Пашкоў (з 1996), Б.І.Сачанка (да 5.7.1995); намеснік галоўнага рэдактара — адказны сакратар кандыдат біялагічных навук Я.В.Малашэвіч (з 21.8.1995 да 20.2.1996 в. а. галоўнага рэдактара); намеснікі галоўнага рэдактара доктар гістарычных навук П.Ц.Петрыкаў, С.П.Самуэль, кандыдат гістарычных навук І.П.Хаўратовіч; намеснік адказнага сакратара М.М.Курловіч.

**Навукова-галіновыя і кантрольныя рэдакцыі**

**Рэдакцыя гісторыі Беларусі**
Заг. рэдакцыі — кандыдат гістарычных навук В.У.Скалабан (да 14.10.1995), кандыдат гістарычных навук Л.У.Языковіч (в.а. заг. рэдакцыі з 15.10.1995); вядучы навуковы рэдактар А.В.Скараход; навуковыя рэдактары М.І.Аўсяная, В.М.Барадуліна, Ю.В.Бажэнаў, В.В.Гусева, кандыдат гістарычных навук А.В.Іоў, А.А.Мяснікоў, кандыдат гістарычных навук В.С.Пазднякоў; рэдактар Н.А.Дзянісава.

**Рэдакцыя ўсеагульнай гісторыі з групай гісторыка-дакументальных хронік «Памяць»**
Заг. рэдакцыі — Г.К.Кісялёў; вядучы навуковы рэдактар З.І.Каршакова; навуковыя рэдактары Л.М.Драбовіч, У.Я.Калаткоў, І.В.Камароў, Ф.І.Кітаева, Н.І.Снытко, Н.В.Шаўрук.

**Рэдакцыя філасофіі, эканомікі і права**
Заг. рэдакцыі — кандыдат філасофскіх навук С.Ф.Дубянецкі; вядучыя навуковыя рэдактары Г.А.Маслыка, кандыдат эканамічных навук У.А.Салановіч; навуковыя рэдактары Т.М.Грынько, В.В.Краснова; рэдактар М.У.Маркевіч.

**Рэдакцыя літаратуры, мовы, фальклору і этнаграфіі**
Заг. рэдакцыі — І.Д.Сіпакоў; вядучы навуковы рэдактар кандыдат філалагічных навук І.У.Саламевіч; навуковыя рэдактары І.С.Александровіч, А.А.Грачанікава, Г.І.Дайлідава, Т.Я.Жэбіт, Т.А.Меляшкевіч.

**Рэдакцыя мастацтва і архітэктуры**
Заг. рэдакцыі — А.А.Дылейка; навуковыя рэдактары Л.І.Паўловіч, Л.А.Сівалобчык, Г.А.Фатыхава; рэдактар Л.У.Кучынская.

**Рэдакцыя біялогіі, медыцыны і сельскай гаспадаркі**
Заг. рэдакцыі — А.К.Фядосаў; навуковыя рэдактары кандыдаты біялагічных навук Г.У.Вынаеў, Л.В.Кірыленка, А.Г.Купцова, навуковыя рэдактары Т.І.Малашэвіч, В.А.Пазняк, Л.М.Шастакова.

**Рэдакцыя геаграфічных навук**
Заг. рэдакцыі — кандыдат гістарычных навук В.П.Кісель; навуковыя рэдактары І.Я.Афнагель, С.А.Крукава, В.М.Круцько, кандыдат геолага-мінералагічных навук Т.В.Якубоўская; рэдактары С.А.Гарбачова, А.А.Трухан.

**Рэдакцыя фізіка-матэматычных і тэхнічных навук**
Заг. рэдакцыі — кандыдат фізіка-матэматычных навук А.І.Болсун; вядучы навуковы рэдактар У.М.Сацута; навуковыя рэдактары П.С.Габец, Н.П.Ракіцкая, кандыдат хімічных навук Л.М.Скрыпнічэнка, Л.М.Шахлевіч, В.А.Юшкевіч.

**Кантрольна-метадычная рэдакцыя**
Заг. рэдакцыі — Л.В.Календа; вядучы навуковы рэдактар В.В.Гетаў; навуковыя рэдактары Р.Р.Блашко, І.У.Косціна, Н.К.Мазоўка, І.А.Маліноўская, М.А.Маўзон, Т.І.Нішт, М.В.Пятроўская, Л.А.Суднік.

**Рэдакцыя літаратурнага кантролю**
Заг. рэдакцыі — Т.М.Бутэвіч; вядучы навуковы рэдактар Е.П.Фешчанка; навуковыя рэдактары В.М.Башак, Г.М.Малей, Т.П.Панчанка, А.А.Федасеева (з 24.8.1995).

**Рэдакцыя мастацка-тэхнічнага афармлення выданняў**
Заг. рэдакцыі — А.М.Хількевіч; вядучы навуковы рэдактар А.У.Плюшч; навуковыя рэдактары Н.В.Барай, В.У.Мінько; рэдактар В.М.Вераценнікава.

**Група картаграфіі**
Г.Р.Шыкунова, Т.У.Кавалеўская.

**Група тэхнічных рэдактараў**
М.І.Грыневіч, Н.М.Шэвель.

**Рэдакцыя фотаздымак і фотаілюстрацый**
Заг. рэдакцыі — Г.М.Бажанкоў; фотакарэспандэнты А.П.Дрыбас, В.У.Харчанка; фатографы С.А.Жукавень, І.У.Каваленка.

**Рэдакцыя камп'ютэрнай падрыхтоўкі рукапісаў**
Заг. рэдакцыі — С.А.Макаёнак; інжынеры Г.А.Гурбо, І.М.Кузьмянкова; аператары С.А.Быткоўская, І.У.Грыцэль, А.У.Гурыновіч, Н.М.Зубкевіч.

**Вытворчы аддзел**
Заг. аддзела — Т.Р.Рыбакова; інжынеры Т.М.Грыцышын, А.М.Красавіна.

**Участак размнажальнай тэхнікі**
Друкар-электрафатограф Ф.А.Юркевіч; пераплётчыца Я.М.Кузьміна.

**Карэктарская**
В.І.Багдановіч, Л.С.Зіза, Г.Дз.Навіцкая, З.К.Надумовіч, А.В.Семенчукова, Л.В.Суцягіна.

**Навуковая бібліятэка**
Заг. — Р.В.Ахрэмчык, бібліятэкар-бібліёграф Г.А.Краўчанка.

**Машынапіснае бюро**
Г.Л.Анісімава, А.І.Барнёва, Т.Л.Барысоўская, К.А.Малюкевіч, Т.М.Саленік.

**Агульная рэдакцыя**
Л.С.Журава, Т.А.Кароткіна, Т.Ф.Піліповіч, В.М.Пачэпка.

**Аддзел эканамічнага аналізу і бухгалтарскага ўліку**
Л.В.Сіпакова, М.А.Макаранка, Т.І.Лук'янава, А.А.Клюева, Н.Ю.Пыркіна, А.С.Бельская.

**БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ**

**ТОМ 1**

А — АРШЫН

У томе змешчаны 1104 ілюстрацыі, у т.л. 100 партрэтаў, 59 картаў

Мастацкае афармленне *Э.Э.Жакевіча, А.М.Хількевіча*

Мастацкія рэдактары: *В.У.Мінько, А.У.Плюшч*

Тэхнічныя рэдактары: *М.І.Грыневіч, Н.М.Шэвель*

Карэктары: *В.І.Багдановіч, Л.С.Зіза, Г.Дз.Навіцкая, З.К.Надумовіч, А.В.Семенчукова, Л.В.Суцягіна*

Падпісана да друку 25.3.96. Фармат 84×108 $^{1}/_{16}$. Гарнітура Таймс. Папера афсетная. Ум. друк. арк. 57,96. Ум. фарб.-адб. 232,7. Ул.-выд. арк. 97,14. Тыраж 10 000 экз. Заказ 839.

Выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя» імя Петруся Броўкі Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па друку. Ліцэнзія ЛВ № 10. Рэспубліка Беларусь. 220072, г. Мінск, вул. Ф.Скарыны, 15а.

Надрукавана з арыгінал-макета на Мінскай фабрыцы каляровага друку. Рэспубліка Беларусь. 220115, г. Мінск, вул. Каржанеўскага, 20.

**Беларуская** энцыклапедыя: У 18 т. Т. 1: А —.Аршын / Рэдкал.: Г.П.Пашкоў і інш. — Мн.: БелЭн, 1996. — 552 с.: іл.

**Б 43**

**ISBN 985-11-0036-6 (Т. 1)**
**ISBN 985-11-0035-8**

**0304760000—002**
**Б ——————— 1—95**
**М 318(03)—96**

**ББК 92(4Беи)**